
БЕЛ

АКАДЭМІЯ НАВУК БССР

ГАЛОЎНАЯ РЭДАКЦЫЯ
БЕЛАРУСКАЙ САВЕЦКАЙ ЭНЦЫКЛАПЕДЫІ

БЕЛАРУСКАЯ САВЕЦКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

П. У. БРОЎКА (галоўны рэдактар), Р. І. АРЫКА, К. К. АТРАХОВІЧ (Кандрат Крапіва), М. А. БАРЫСЕВІЧ, І. Д. КАЗЕКА (намеснік галоўнага рэдактара), А. К. КРАСІН, К. І. ЛУКАШОЎ, А. В. ЛЫКАЎ, Ф. С. МАРЦІНКЕВІЧ, А. С. МАХНАЧ, М. Дз. НЕСЦЯРОВІЧ, А. Л. ПЕТРАШКЕВІЧ (адказны сакратар), П. Дз. ПУЗІКАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), М. Я. САЎЧАНКА, С. Г. СКАРАПАНАЎ, Я. І. СКУРКО (Максім Танк), Ф. І. ФЕДАРАЎ, К. І. ШАБУНЯ, Р. Р. ШЫРМА, М. Ф. ЯРМОЛЕНКА, М. П. ЯРУГІН.

ТОМ V

ЗУЙКІ—КІШЫ

МІНСК. 1972

5-43

РЭДАКЦЫЙНЫ САВЕТ

П. У. БРОЎКА (старшыня савета), Л. С. АБЭЦЭДАРСКІ, В. К. БАНДАРЧЫК, Ф. В. БАРАВІК, В. В. БАРЫСЕНКА, Г. І. БАРЫШАЎ, А. І. БОЛСУН, С. Х. БУДЫКА, І. А. БУЛЫГІН, К. П. БУСЛАЎ, Г. К. ГАРАНСКІ, Г. І. ГАРЭЦКІ, Д. М. ГОЛУБ, В. А. ГРАМЫКА, Г. Х. ДАЎГЯЛА, В. А. ДЗЯМЕНЦЬЕЎ, М. У. ДЭМБІНСКІ, М. А. ЕЛЬЯШЭВІЧ, В. П. ЖУКАЎ, В. Р. ЗАЎРЫЕЎ, В. У. ІВАШЫН, І. М. ІГНАЦЕНКА, В. М. КАВАЛІН, Г. Ц. КАВАЛЕЎСКІ, Р. К. КАЖЭЎНІКАВА, М. С. КАЗЛОЎ, Н. В. КАМЕНСКАЯ, Р. В. КАНАВАЛАЎ, М. Ф. КАПІЧ, У. А. КАРОЛЬ, У. І. КРЫЛОЎ, А. А. ЛАБОВІЧ, Г. М. ЛІЎШЫЦ, М. П. ЛОБАН, І. М. ЛУШЧЫЦКІ, С. М. МАЛІНІН, В. С. МАЎРЫШЧАЎ, Б. П. МІЦКЕВІЧ, М. Р. МУРАШКА, У. І. НЯФЕД, Ф. М. НЯЧАЙ, М. І. ПАХОМАЎ, Э. М. ПОЗНЯК, П. Ф. ПРАТАСЕНЯ, Дз. П. РАДЗЮК, П. Ф. РАКІЦКІ, М. Т. РАМАНОЎСКІ, М. А. САВІЦКІ, Э. М. САВІЦКІ, А. К. САННІКАЎ, У. М. СІКОРСКІ, І. А. СКРЫГАН, Р. Л. СТАРОБІНЕЦ, М. Р. СУДНІК, Дз. А. СУПРУНЕНКА, В. І. СЦЯПАНАЎ, У. М. ТРАЦЦЯКОЎ, І. І. ТРУХАН, С. А. УМРЭЙКА, В. В. УРУСАЎ, І. П. ХАЎРАТОВІЧ, Г. І. ЦІТОВІЧ, Р. С. ЧАБАТАРОЎ, У. А. ЧАНТУРЫЯ, М. Я. ШКЛЯР, В. А. ШКУРКО, Л. М. ШНЕЕРСОН, В. І. ШЭМПЕЛЬ, Э. А. ЮШКЕВІЧ, В. І. ЯЛАТАЎ, П. І. ЯШЧАРЫЦЫН.

ТЭРМІНАЛАГІЧНАЯ КАМІСІЯ

К. К. АТРАХОВІЧ (Кандрат Крапіва) — старшыня камісіі, М. Р. СУДНІК — намеснік старшыні камісіі; члены камісіі: М. В. БІРЫЛА, П. У. БРОЎКА, М. М. ГАНЧАРЫК, Г. І. ГАРЭЦКІ, І. Д. КАЗЕКА, А. А. КАРАТАЙ (Максім Лужанін), Ц. В. КРЫСЬКО (Васіль Вітка), М. П. ЛОБАН, В. І. РАБКЕВІЧ, І. І. СЕМЯЖОНАЎ (Язэп Семяжон), І. А. СКРЫГАН, Ф. І. ФЕДАРАЎ, Л. М. ШАКУН, Ф. М. ЯНКОЎСКІ.

НАВУКОВЫЯ КАНСУЛЬТАНТЫ 5-га ТОМА

М. Г. АГУРЦОЎ, І. П. АНТОНАЎ, П. Ц. АСТАШЭНКАЎ (Масква), С. Р. АЎСЯННІКАЎ, Ю. С. БАГДАНАЎ, У. А. БЕЛЫ (Гомель), А. А. БІРАЛА, В. Б. БОЙКА, Р. В. БУЛАЦКІ, Дз. П. БЯЛЯЦКІ, Н. Б. ВАТАЦЫ, А. С. ВЕЧАР, В. В. ГАЎРЫЛЮК, Ф. Дз. ГАХАЎ, Н. С. ГІЛЕВІЧ, Дз. П. ГОРСКІ (Масква), А. Е. ГУРЫНОВІЧ, В. С. ДАВЫДАВА, М. П. ДАРАФЕЕНКА, А. В. ДУЛАЎ, М. П. ЕРПЫЛЕЎ (Масква), В. А. ЖУЧКЕВІЧ, А. І. ЗАЛЕСКІ, І. С. КАВАЛЕЎ, Л. В. КАЗЛОЎСКАЯ, У. А. КАЛЕСНІК (Брэст), У. С. КАМАРОЎ, Я. Р. КАНАВАЛАЎ, Г. В. КІСЯЛЕЎ (Вільнюс), У. М. КОНАН, А. В. КРАСІНСКІ, М. І. КРАСОЎСКІ, В. Р. КРАСТОЎСКІ, М. Р. КРУЦЬКО, В. Я. КРЫШЧАНОВІЧ, К. А. КУЛІНКОВІЧ, І. І. КУПЧЫНАЎ (Гомель), І. І. ЛЕАНОВІЧ, П. П. ЛІПІЛА, А. А. ЛОЙКА, В. Дз. МАРОЗАЎ, А. І. МЕТЧАНКА (Масква), В. Ф. МЯДЗВЕДЗЕЎ, І. Я. НАВУМЕНКА, Г. Л. НАПРЭЕЎ, І. М. ПАНЬШЫНА, Р. М. САМАРЫН (Масква), В. І. СЕМЯНКОЎ, Дз. Ф. СІДАРЭНКА, Н. А. СНІЦАРАВА, Г. Р. СЯНКЕВІЧ, Г. К. ТАТУР, М. М. УЛАШЧЫК, М. Я. ЦІКОЦКІ, Г. В. ШТЫХАЎ, С. А. ШЧАРБАКОЎ, В. П. ЯКУШКА, С. Я. ЯНЧАНКА.

116812
Центральная научная
БИБЛИОТЕКА

З



ЗУЙКІ, назва некалькіх відаў птушак сям. сяўцоў атр. *сеўцападобных.* У СССР 7 відаў, на Беларусі 2: вялікі З.— *гальштучнік* і малы З. (Charadrius dubius).

Даўж. цела 16—22,5 *см*, размах крылаў 45—50,5 *см*, вялікая галава, адносна кароткая слабая дзюба, доўгія крылы. Малы З. адрозніваецца ад вялікага чорнаю дзюбаю. Пашыраны ў большасці раёнаў Беларусі. Гняздуецца на пясчаных водмелях Дняпра, Прыпяці, Сажа і інш. рэк. Нясе 4 яйцы. Корміцца беспазваночнымі.

ЗУЛЬФІЯ [сапр. Ісраілава Зульфія; н. 16.2(1.3).1915, Ташкент], узбекская савецкая паэтэса. Нар. паэтэса Узб. ССР (1965). Чл. КПСС з 1953. Вучылася ў Узб. жаночым пед. вучылішчы. Друкуецца з 1930. Першы зб. «Старонкі жыцця» (1933). Лірыка З. прысвечана разняволенай жанчыне Усходу, барацьбе за мір, дружбе народаў (зб. «Дзявочыя песні», 1939; «Вернасць», 1943; «Хулькар», 1947; «Размова з сяброўкай», 1953; «Блізкія сэрцу майму», 1958; «Думы», 1965; паэма «Сонечнае пяро», 1970).



Аўтар лібрэта оперы «Зейнаб і Аман» (паводле паэмы Алімджана Хаміда). Перакладала на узб. мову творы Я. Коласа, Э. Агняцвет, Е. Лось. На бел. мову творы З. пераклі Агняцвет, Р. Барадулін, А. Вярцінскі, А. Лойка, Лось, Ю. Свірка і інш. На XVI—XVIII з'ездах КП Узбекістана выбрана чл. ЦК. Рэсп. літ. прэмія імя Хамзы (1970), міжнар. прэміі імя Дж. Нэру (1968) і «Лотас» (1970). Узнагароджана ордэнам Леніна, 3 іншымі ордэнамі, медалямі.

Тв.: Бел. пер.— Лірыка, Мн., 1967; у кн.: Спявае Узбекістан, Мн., 1962; Сонца ў арыках, Мн., 1966; рус. пер.— Живой дождь, Ташкент, 1965; Сердце в пути, Ташкент, 1966; Моя весна, М., 1967; Водопад, Ташкент, 1969.

Літ.: Акбаров А. Высокие звезды поэзии, Ташкент, 1970, с. 173—215. *І. У. Саламевіч.* Мінск.

ЗБІГМУНТ III Ваза (Сігізмунд III Ваза, Zygmunt III Waza; 20.6.1566—30.4.1632), польскі кароль і вялікі князь Вял. кн. Літ. [1587—1632], швед. кароль [1592—1604, фактычна да 1599]. Выхаванец езуітаў. Каралём Рэчы Паспалітай выбраны па ініцыятыве сярэдняй шляхты, якая пазней не падтрымлівала яго ўнутр. і знешняй палітыкі. Прагнаны з швед. трону пратэстантамі; уцягнуў Рэч Паспалітую ў вайну са Швецыяй, што прывяло да страты б. ч. Ліфлянды. Падтрымліваў Габсбургаў — натхняльнікаў каталіцкай рэакцыі ў Еўропе, памог ім разграміць паўстанне ў Чэхіі, садзейнічаў заключэнню *Брэсцкай уніі 1596* і ўстанаўленню ў Рэчы Паспалітай каталіцкай рэакцыі. Заахвочваў напады польскіх магнатаў на рус. землі, падтрымліваў Лжэдзмітрыя I. У 1609 пачаў інтэрвенцыю супраць Расіі, але пацярпеў паражэнне. Пры З. ўзмацніўся феад. і нац.-рэліг. прыгнёт.

Літ.: История Польши, т. 1, 2 изд., М., 1956. *П. Р. Казлоўскі.* Мінск.

ЗЫЛЬ Васіль Канстанцінавіч [н. 20.4(3.5). 1902, в. Востраў Ігуменскага пав. Мінскай губ.], Герой Сав. Саюза (1945). З сялян. Чл. КПСС з 1927. У Чырв. Арміі з 1923. У Айч. вайну на Зах., Калінінскім, Паўн.-Зах., Сталінградскім, Данскім і 1-м Укр. франтах — камандзір мінамётнага палка. Вызначыўся пры фарсіраванні Одэра. 25.1.1945 мінамётчыкі першыя пераправіліся цераз раку на Пд ад Штэйнаў (Сцінава) і агнём падтрымлівалі пяхоту, якая вяла баі за расшырэнне плацдарма. Жыве ў Маскве.



ЗБІСЛАЎ, мемарыяльны комплекс на в-ве Зыслаў у Малагарадзячыцкім с/с Любанскага р-на, дзе ў Вял. Айч. вайну быў цэнтр партыз. руху Мінскай вобл. Уключае 14-метровы









Мемарыяльны комплекс у Зыславе. У в е р с е: абеліск і памятны знак на месцы партызанскага аэрадрома. У н і з е: партызанскія зямлянкі; помнік воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну. Арх. Г. Заборскі. 1969.

абеліск з трох вертыкальных плоскасцяў з шырокай лесвіцай, на пляцоўцы якой пастаўлены дзве стэлы; помнік на магіле сав. воінаў і партызанаў; рэстаўрыраваныя партыз. зямлянкі; памятны знак накшталт вітка спіралі на месцы партыз. аэрадрома. Комплекс адкрыты ў 1969. Аўтар праекта арх. Г. Заборскі.

На востраве размяшчаліся Мінскі падпольны абком і Любанскі райком КП(б)Б, штаб Мінскага партыз. злучэння, партыз. брыгады № 25 імя Памарэнкі, выдаваліся газ. «Звязда», «Чырвоная змена», «Кліч Радзімы», рэгулярна дзейнічаў партыз. аэрадром. З.— філіял *Любанскага музея народнай славы.*

ЗЫЧКОЎ Іван Самсонавіч (н. 6.4.1913, в. Залатва Быхаўскага пав. Магілёўскай губ.), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху ў Магілёўскай вобл. ў Айч. вайну. З сям'і ляп. Чл. КПСС з 1939. У 1937—41 на камсамольскай і сав. рабоце. З жн. 1941 у тыле ворага на падпольнай рабоце, з мая 1942 камандзір партыз. ўзвода, сакратар Магілёўскага падпольнага РК КП(б)Б, камісар атрада, з 1.1.1944 камісар *партызанскага палка 152-га.* З 1944 на парт. і сав. рабоце. Узнаг. ордэнам Чырв. Сцяга, медалямі. Жыве ў Светлагорску.

ЗЫЧНЫЯ ГУКІ, гукі чалавечай мовы, пры вымаўленні якіх на шляху паветра, што выдыхаецца з лёгкіх, узнікае перашкода. У бел. мове 39 зычных гукаў.

Якасці З. г. залежаць ад характару перашкоды і месца яе ў галасавым тракце. Калі органы мовы змыкаюцца, на пэўны час поўнасцю перапыняючы струмень паветра, утвараюцца змычныя (выбухныя) З. г. У бел. мове гэта «п», «п'», «б», «б'», «т», «д», «к», «к'», «г», «г'» («ганак», «гірса»). Калі моўныя органы прапускаюць струмень паветра праз вузкую шчыліну, утвараюцца шчылінныя З. г.: «в», «в'», «ў», «ф», «ф'», «з», «з'», «с», «с'», «ж», «ш», «й», «г», «г'» («гэта», «дарагі»), «х», «х'». Пры камбінацыі гэтых відаў перашкод утвараюцца змычна-шчылінныя (афрыкаты) «дз», «дз'», «ц», «ц'», «дж», «ч»; змычна-праходныя «м», «м'», «н», «н'» (насавыя, назальныя), «л», «л'» (бакавыя, латэральныя), дрыжачы «р». Па ўтварэнні З. г. удзельнічаюць актыўныя (язык, губы) і пасіўныя (зубы, цвёрдае і мяккае паднябенне) органы. Калі перашкода ствараецца губамі, утвараюцца губныя (лабіяльныя) гукі. Адны губныя вымаўляюцца пры актыўным дзеянні абедвюх губ, другія — пры актыўным дзеянні толькі ніжняй губы, якая збліжаецца з верхнімі зубамі. Па актыўным органе губныя З. г. падзяляюцца на губна-губныя (білабіяльныя) («б», «б'», «п», «п'», «ў», «м», «м'») і губна-зубныя (лабіяльна-дэнтальныя) («в», «в'», «ф», «ф'»). Калі пярэдняя частка языка артыкулюе да зубоў або да пярэдняй часткі паднябення, утвараюцца пярэднеязычныя: «д», «т», «з», «з'», «ж», «л», «л'», «н» «н'», «р», «дз», «дз'», «дж», «с», «с'», «ш», «ц», «ц'», «ч». Па пасіўным органе «д», «т», «з», «з'», «с», «с'», «л», «л'», «н», «н'», «р», «дз», «дз'», «ц», «ц'» зубныя (дэнтальныя), а «ж», «ш», «ч», «дж» паднябенна-зубныя. Гук «й» па актыўным органе — сярэднеязычны, па пасіўным — сярэднепаднябенны (палатальны). Гукі «к», «к'», «г», «г'» (выбухныя), «х», «х'», «г», «г'» (фрыкатыўныя) з'яўляюцца заднеязычнымі, або заднепаднябеннымі. Гук «г» часам бывае гартанны («ага», «гэты»). Пры вымаўленні некаторых З. г. разам з асн. перашкодаю назіраецца дадатковы пад'ём сярэдняй часткі языка да паднябення. Так утвараюцца мяккія, або палаталізаваныя гукі: «стал'», «гнац'». Бел. мяккія «ц'», «дз'», «с'», «з'» утвараюцца пры паслаблены дзеянні кончыка языка. Акустычна З. г. складаюцца з голасу і шуму. У гуках «л», «л'», «м», «м'», «н», «н'», «р», «й», «ў», «в», «в'» пераважае голас, таму яны называюцца санорнымі. У астатніх пераважае шум — гэта шумныя гукі. Яны падзяляюцца на глухія і звонкія. Звонкія «б», «б'», «д», «дз'», «з», «з'», «ж», «дж», «г», «г'» складаюцца з голасу і шуму, а глухія «ф», «ф'», «с», «с'», «ш», «ч», «п», «п'», «х», «х'», «к», «к'», «ц», «ц'» толькі з шуму. Гукі «ж», «ш», «ч», «дж» наз. шыпячымі, а «з», «з'», «с», «с'», «дз», «дз'», «ц», «ц'» — свісцячымі. Санорныя гукі вымаўляюцца ў слове толькі непасрэдна перад галоснымі або пасля іх. Шумныя займаюць розныя пазіцыі ў складзе. У моўнай плыні З. г. утвараюць фанет. сістэму зычных — кансанантызм.

Літ.: Курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Фанетыка. Арфаграфія. Лексікалогія, Мн., 1961; Юргелевіч П. Я. Нарыс сучаснай беларускай мовы з гістарычнымі каментарыямі, 2 выд., Мн., 1961; Падлужны А. І. Фаналагічная сістэма беларускай літаратурнай мовы, Мн., 1969.

А. І. Падлужны. Мінск.

ЗЭГЕРС (Seghers) Ганна (сапр. Радвані Нені, дзявочае прозв. Рэйлінг; н. 19.11.1900, г. Майнц), нямецкая пісьменніца. Чл. КПГ з 1928. З сям'і мастацтвазнаўца. Вучылася ў ун-тах Кёльна (1919—21) і Гейдэльберга (1921—24). У 1933 эмігравала ў Францыю, з 1940 у Мексіцы. У 1947 вярнулася на радзіму. Актыўна ўдзельнічае ў буд-ве сацыяліст. культуры ГДР. Першыя апавяданні (сярэдзіна 20-х г.) адзначаны рысамі натуралізму. Аповесць «Паўстанне рыбакоў» (1928) пра стыхійнае народнае выступленне. На творчасць З. мелі ўплыў Ф. Дастаеўскі, Л. Талстой, М. Горкі. Рэвалюц. рух пралетарыяту ў Германіі, сацыяліст. буд-ва ў СССР спрыялі



станаўленню ў яе творчасці метаду сацыяліст. рэалізму. Раман «Спадарожнікі» (1932) сцвярджае інтэрнац. салідарнасць камуністаў розных краін. Раманы «Ацэненая галава» (1933), «Шлях праз люты» (1935), «Уратаванне» (1937), «Транзіт» (1948) раскрываюць трагедыю народа, адурманенага фаш. прапагандай, барацьбу антыфашыстаў на чале з камуністамі супраць гітлерызму. У рамане «Сёмы крыж» (на англ. мове 1942, на ням. 1946) паказана аптыміст. вера ў перамогу над фашызмам. Раман-эпапея «Мёртвыя астаюцца маладымі» (1949) — гісторыя сац.-паліт. жыцця Германіі ў 1918—45. Дылогія — «Рашэнне» (ч. 1—2, 1959—61) і «Давер» (1968) — паказвае барацьбу працоўных ГДР за перамогу сацыялізма. З.— шчыры сябар СССР, актыўны змагар за мір. Чл. Нямецкай акадэміі мастацтва (з 1950), чл. Сусв. Савета Міру (з 1950). Нац. прэміі ГДР 1951 і 1959. Міжнар. Ленінская прэмія «За ўмацаванне міру паміж народамі» за 1951.

Тв.: Бел. пер.— Чалавек і яго імя. Аповесць, Мн., 1958; у час.— «Полымя», 1953, № 7; там жа, 1970, № 10; «Беларусь», 1965, № 10; рус. пер.— Повести и рассказы, М., 1957; Решение, М., 1961; Транзит, М., 1961; Карибские рассказы, М., 1963; Сила слабых. Девять рассказов, М., 1967; Доверие, М., 1969; Седьмой крест, М., 1970.

Літ.: Анна Зегерс. Вибиблиогр. указатель, М., 1964.

ЗЭЛЬВА, гар. пасёлак (з 1940), цэнтр Зэльвенскага р-на Гродзенскай вобл., на левым беразе р. Зальвянкі (прыток Нёмана). За 132 *км* на ПдУ ад Гродна; чыг. ст. на лініі Баранавічы — Ваўкавыск. 4,3 тыс. ж. (1971). Прамысл. прадпрыемствы: лесазавод, маслазавод, камбінат быт. абслугоўвання, раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі, Бародзіцкае спецыялізаванае аддз. Сельгастэхнікі, мех. кар'ер, пякарня. Сярэдняя школа, школа-інтэрнат, школа рабочай моладзі, завочная сярэдняя, муз. і дзіцячая спарт. школы, Дом піянераў, дзіцячы яслі-сад, Дом культуры, кінатэатр, 2 б-кі, бальніца. Помнік сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну.

Упамінаецца ў пісьмовых крыніцах з 16 ст. Уваходзіла ў склад Гродзенскай каралеўскай эканоміі, належала Сапегам. У 1863 перададзена ў казну. У сярэдзіне 19 ст. Зэльвенскі (Анненскі) кірмаш меў важнае эканам. значэнне для Гродзенскай і Віленскай губ. У 1897 у З. было 1011 ж. У часы бурж. Польшчы (1921—39) — у Ваўкавыскім пав. Беластоцкага ваяводства. Акупавана (з чэрв. 1941 да 12.7.1944) ням.-фаш. захопнікамі.

ЗЭЛЬВЕНСКІ РАЁН, у складзе Гродзенскай вобл. Утвораны 15.1.1940. На Пд вобласці. Пл. 1,1 тыс. *км²*. Нас. 36,9 тыс. чал. (1971). У раёне 12 сельсаветаў. Цэнтр г. п. Зэльва.



Краявід каля вёскі Драпаўцы Чырванасельскага сельсавета.

Зах. ч. раёна ў межах Ваўкавыскага ўзв. (найвыш. пункт раёна 239 *м* над узр. м.), усх. ў межах Слонімскага ўзв., у цэнтр. ч. даліна р. Зальвянкі, якая на Пн пераходзіць у Нёманскую нізіну. Карысныя выкапні: 2 радовішчы цагельнай сыравіны з агульнымі запасамі 0,63 млн. $м^3$ (у т. л. радовішча Пустаборы 0,54 млн. $м^3$), радовішча цэментавых глінаў Дзеркачы 5,2 млн. *т*. Сярэдняя т-ра студз. ад −4,9 да −5,4, ліп. 17,8—18,2 °С. Ападкаў каля 550 *мм* за год. Вегет. перыяд 198 дзён. Рэкі Зальвянка (левы прыток Нёмана), Шчара (цячэ на мяжы з Дзятлаўскім р-нам), Луконіца, Бяроза (прытокі Шчары). Шчара сплаўная. Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (64,5%), дзярнова-падзолістыя забалачаныя (13,5%), дзярнова-балотныя (8,1%), тарфяна-балотныя (6,2%), алювіяльныя (7,5%) і інш. З мінер. глебаў 16,4% сугліпкавых, 77,2 супясчаных, 6,4% пясчаных. Якасная ацэнка глебаў у балах: ворных зямель 41 (цана бала 0,31 *ц/га* збожжа), кармавых угоддзяў 28, усіх с.-г. угоддзяў 38. Лясы займаюць каля 13% тэр. (невялікія масівы на З і У раёна). Даліна Зальвянкі і вярхоўе Луконіцы забалочаныя. Насельніцтва — беларусы, ёсць рускія, палякі і інш. Сярэдняя шчыльн. 33,5 чал. на 1 $км^2$. Гарадскога нас. 11,7%.

Зэльва. Цэнтральная плошча.



Прамысловасць перапрацоўвае мясцовую сыравіну. У Зэльве лесазавод, маслазавод, камбінат быт. абслугоўвання, раённае аб'яднанне Сель-



гастэхнікі, пякарня, мех. кар'ер; у Дзярэчыне лесазавод, пякарня, каўбасны цэх; Сынковіцкі спіртзавод, Бародзіцкае спецыялізаванае адда. Сельгастэхнікі, торфапрадпрыемства «Вішнёўка», Пустаборскі цагельны з-д. У раёне 23 калгасы і саўгас (1971).

Калгасы і іх цэнтры: «Беларусь» *(Клімавічы)*, імя Будзённага *(Старое Сяло)*, імя Гагарына *(Угрынь)*, «XX парта'езд» *(Чырвонае Сяло)*, імя Дзяржынскага *(Рудзевічы)*, «Дружба» *(Крамяніца)*, «Зара» *(Снежная)*, «Іскра» *(Крывічы)*, «Каралін» *(Каралін)*, «Кастрычнік» *(Манцялкі)*, імя Леніна *(Бародзічы)*, «Маладая гвардыя» *(Мадзейкі)*, імя Мічурына *(Крамяніца Дольская)*, «Новае жыццё» *(Кашалі)*, «Перамога» *(Тулава)*, «Прагрэс» *(Князева)*, «Радзіма» *(Востраве)*, «Расія» *(Межырэчы)*, імя Чапаева *(Цялгелевічы)*, імя Чарняхоўскага *(Дзярэчын)*, «Шлях да камунізма» *(Зэльва)*, «Шлях Леніна» *(Славацічы)*, імя Якуба Коласа *(Залацеева)*. Саўгас «XVIII парта'езд» *(Ёлка)*.

С. гасп. спецыялізуецца на жывёлагадоўлі мяса-малочнага кірунку ў спалучэнні з ільнаводствам і пасевамі цукр. буракоў; вырошчваюць бульбу і збожжавыя. Пад с.-г. ўгоддзямі каля 58% тэр. раёна. Асушана 5,8 тыс. *га* забалочаных зямель (1971). Агульная пасяўная пл. (тыс. *га*, 1970) 46,0, з іх збожжавыя і зернебабовыя займаюць 18,7, тэхнічныя 2,4 (у т. л. лён 1,6), бульба 6,1, кармавыя 18,3. На пач. 1971 было (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 40,3 (у т. л. кароў 17,2), свіней 28,8, авечак і коз 6,2. Па тэр. раёна праходзяць чыгунка Ваўкавыск — Баранавічы, аўтамаб. дарогі Слонім — Ваўкавыск і Слонім — Масты.

Малочнатаварная ферма ў калгасе імя Мічурына.



У раёне (на пач. 1971) 8 сярэдніх, 18 васьмігадовых, 1 школа-інтэрнат, 40 пач. школ, 1 школа рабочай і сельскай моладзі, 2 дашкольныя ўстановы, 47 клубных устаноў, 49 масавых б-к, 56 кінаўстановак (у т. л. 50 стацыянарных), 7 бальніц, 3 амбулаторыі, 13 фельч.-ак. пунктаў. У 1971 у раёне працавала 455 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, у т. л. 11 інжынераў, 49 аграномаў, 25 заатэхнікаў, 19 вет. урачоў, 278 настаўнікаў, 33 урачы; 854 чал. з сярэдняй спец. адукацыяй. Раённая газ. «Праца».

В. С. Вайткевіч. Мінск.

ЗЮБІН Павел Пятровіч [3(16).11.1910, Белгарад — 24.6.1944], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1941. У Чырв. Арміі з 1936. Вызначыўся ў Віцебскай вобл. 22—24.6.1944. Полк на чале з маёрам З. знішчыў агнявую сістэму праціўніка каля Сіроціна, 12 назіральных пунктаў, 80 агнявых кропак. Загінуў у баі. У Гарадку Віцебскай вобл. помнік З., яго імем названа вуліца.



ЗЮВАНАЎ Міхаіл Акімавіч [н. 24.2(9.3).1906, Грозны], беларускі савецкі спявак (бас). Нар. арт. БССР (1954). У 1951 скончыў Бел. кансерваторыю (клас Я. Віцінга). Саліст т-раў оперы і балета ў Баку (1938—41), Ташкенце (1941—42), Фрунзе (1942—44), Маскве (Вялікі тэатр, май—снежань 1944), Пярмі (1944—49). У 1949—61 саліст Беларускага т-ра оперы і балета. Выступаў у нацыянальным рэпертуары: Дураў («Надзея Дурава» А. Багатырова), Даніла і Аніщчук («Дзяўчына з Палесся» і «Міхась Падгорны» Я. Цікоцкага), Якуб («Марынка» Р. Пукста). З роляў у класічных операх: Барыс Гадуноў («Барыс Гадуноў» М. Мусаргскага), Канчак («Князь Ігар» А. Барадзіна), Сусанін («Іван Сусанін» М. Глінкі),



М. А. Зюванаў у ролі Аніщчука (справа).

Млынар («Русалка» А. Даргамыжскага), Грэмін, Качубей («Яўген Анегін», «Мазепа» П. Чайкоўскага), Дон Базіліо («Севільскі цырульнік» Дж. Расіні), Мефістофель («Фаўст» Ш. Гуно), Кецал («Прададзеная нявеста» Б. Сметаны). Вак.-сцэнічным вобразам З. ўласцівыя рэльефнасць, сакавітасць, маст. пераканальнасць. З 1962 выкладае ў Бел. кансерваторыі. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга.

Літ.: Журавлёў Д. Шлях акцёра, у кн.: Майстры беларускай сцэны, Мн., 1960.

ЗЮЗЬКОЎ Андрэй Ігнатавіч [13(26).9.1904, мяст. Шклоў Магілёўскай губ.— 28.6.1938], беларускі савецкі гісторык. Чл. КПСС з 1925. Скончыў Камуніст. ун-т імя Леніна (1927). У 1918—24 працаваў на папяровай ф-цы ў Барысаве, з 1928 на парт. рабоце ў Жыткавічах. У 1928—29 у Чырв. Арміі. З 1930 навук. супрацоўнік, у 1934—37 нам. дырэктара Ін-та гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б. Аўтар прац па гісторыі Камуністычнай партыі Беларусі.

Тв.: Крывавы шлях беларускай нацдэмакратыі, Мн., 1931; Бальшавікі — арганізатары Кастрычніка ў Беларусі, Мн., 1934; 1905 год на Беларусі, «Бальшавік Беларусі», 1935, № 15.

А. А. Кузняеў. Мінск.

ЗЮЗЯ, бог холаду ў язычніцкай міфалогіі ўсх. славян.

Уяўляўся З. як лысы, барадаты дзед, які ў расхрыстаным кажусе, босы ходзіць па снезе і лютай сцюжаю наганяе страх на ўсё жывое. Ад яго подыху ўздымалася завіруха і мяцеліца. Калі ад марозу трашчалі дрэвы і бярвенне ў хаце, лічылі, што гэта З. б'е па іх вялікай булавой-доўбняй. Было павер'е: мароз памякчае, калі пералічыць імёны ўсіх лысых дзядоў у вёсцы.

ЗЮЛЬКОЎ Пётр Маркавіч (16.1.1924, в. Конаўка Жыздрынскага пав. Бранскай губ.— 27.6.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1944. На фронце з 1943. Вызначыўся ў Магілёўскай вобл. 27.6.1944 у баі за в. Трылесіна Быхаўскага р-на паўтарыў подзвіг А. М. Матросава — закрыў амбразуру дзота сваім целам.

ЗЯБЕР (Galeopsis), род аднагадовых апушаных травяністых раслін сям. губакветных. Вядома каля 20 відаў, пашыраных ва ўмеранай зоне Еўропы і Азіі. У СССР 6 відаў, на Беларусі 5.



Зябер звычайны.

Сцябло чатырохграннае, галінастае, выш. да 1 м. Лісце ліцападобналанцэтнае, зубчастае. Кветкі няправільныя, з двухгубым вяночкам, сабраныя ў несапраўдныя кальчакі ў пазухах лісця. Плод — 4 арэшкі. Амаль усе віды — палявое пустазелле. Найб. вядомыя З. ладаннікавы (G. ladanum, нар. назвы: каласніца летняя, меднік ружовы, базіліка палявая), З. прыгожы (G. speciosa, нар. назва мядоўнік) і З. звычайны (G. tetrahit). Большасць З. добрыя меданосы. У насенні больш за 4% алею, прыгоднага на тэхн. выкарыстанне. Некат. віды З. атрутныя.

Літ.: Флора БССР, т. 4, Мн., 1955.

ЗЯБКІ, вёска ў Глыбоцкім р-не Віцебскай вобл., на беразе воз. Свядова; чыг. ст. на лініі Полацк — Маладзечна. Цэнтр сельсавета і саўгаса імя Дзяржынскага. За 44 *км* на ПнУ ад Глыбокага, 150 *км* ад Віцебска, каля шашы Глыбокае — Полацк (1 *км*). 341 ж., дварoў 132 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, сталовая, 4 магазіны. Магіла старшыні сельсавета У. І. Лабзова, якога забілі ворагі Сав. улады ў 1946.

ЗЯБЛЕВАЕ ВО́РЫВА, асенняе ворыва пад яравыя культуры або пад чорны папар. У выніку З. в. ворны слой робіцца рыхлы і камякаваты, назапашваецца і лепш зберагаецца вільгаць у глебе ў асенне-зімовы перыяд, паляпшаецца распад рэштак раслін і арган. угнаенняў.

З. в. спрыяе знішчэнню пустазелля, узбуджальнікаў хвароб і шкоднікаў, якія зімуюць у ржышчы і ў верхніх слаях глебы, аблягчае вясенняя палявыя работы. Ураджаі с.-г. культур па зяблеві больш высокія, чым ураджаі на веснавым ворыве. З. в. робяць праз 2—3 тыдні пасля лушчэння ржышча, калі паяўляюцца ўсходы пераважнай масы пустазелля, або адразу пасля ўборкі ўраджаю. На Беларусі найб. эфектыўнае ранняе З. в. (жнівень — пач. верасня).

Літ.: Системы ведения сельского хозяйства Белорусской ССР, Мн., 1970; Основы сельского хозяйства, Мн., 1969.

Р. А. Мельнічак. Мінск.

ЗЯБЛІК, птушка атр. вераб'іных. Гл. *Берасцянка.*

ЗЯБНІЦКІ Мікалай Васілевіч (н. 17.12.1919, в. Нова-Сухоціна Какчэтаўскага пав. Акмолінскай вобл.), Герой Сав. Саюза (1944). З сялян. Чл. КПСС з 1947. У Чырв. Арміі з 1940. Скончыў Арлоўскае ваен.-пяхотнае вучылішча (1941). У Айч. вайну ў тыле ворага — камандзір узвода атрада спец. прызначэння на Зах. фронце. З крас. 1942 камісар, з ліп. 1942 камандзір спец. атрада *«Другія»*, які дзейнічаў у Магілёўскай, Гомельскай, Палескай, Арлоўскай, Смаленскай і Чарнігаўскай абл. У 1943—55 у органах дзяржбяспекі ў Мінску, Рагачове, Гомелі, Растове. Жыве ў Гомелі.



Літ.: Люди легенд, в. 1, М., 1965, с. 455—462.

ЗЯБРАЎКА, чыг. станцыя на лініі Гомель — Бахмач (УССР) і вёска ў Зябраўскім с/с Гомельскага р-на. За 21 *км* на ПдУ ад Гомеля, на аўтамаб. дарозе, якая злучае чыг. ст. з Гомелем. 45 ж., гасп. 15 (1971). Магазін.

ЗЯБРАЎКА, вёска ў Гомельскім р-не. Цэнтр сельсавета. За 18 *км* на ПдУ ад Гомеля, 3 *км* ад чыг. ст. Зябраўка, на аўтамаб. дарозе, якая злучае вёску з Гомелем. 1300 ж., гасп. 400 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, 2 магазіны. Помнік і мемарыяльная дошка на ўшанаванне памяці 91 земляка, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

З'ЯВА І СУТНАСЦЬ, філасофскія катэгорыі, што адлюстроўваюць агульныя і неабходныя бакі ўсіх прадметаў, з'яў і працэсаў аб'ектыўнай рэальнасці. З'ява — тое, што ляжыць на

паверхні рэчаў і працэсаў, канкрэтнае выяўленне ўласцівасцей. Сутнасць — сукупнасць устойлівых унутр. сувязей, адносін рэчаў і працэсаў, якая абумоўлівае законы іх існавання і развіцця. З. і с. непарыўна звязаныя. Адна і тая сутнасць можа выяўляцца па-рознаму, і наадварот — складаная з'ява можа выражаць розныя сутнасці. З'ява выступае як вонкавае выяўленне сутнасці, змяшчае ў сабе моманты апошняй. «...Сутнасць з'яўляецца. З'ява істотная» (Ленін У. І. Тв., т. 38, с. 243).

З. і с. не тоесныя. Калі б выяўленне сутнасці і яна сама непасрэдна супадалі, навука была б непатрэбная. Задача навукі — за бачным, якое з'яўляецца, выявіць глыбінныя працэсы, адкрыць законы, што імі кіруюць. Пазнанне — працэс руху думкі ад з'явы да сутнасці, ад сутнасці першага парадку да сутнасці другога парадку і так бясконца. Пазнанне сутнасці магчыма толькі з удзелам абстрактнага мыслення. Чым вышэйшы парадак пазнавальнай сутнасці, тым больш высокі павінен быць узровень абстрактнага мыслення. З'явы паступова зменьваюцца, сутнасці больш устойлівыя, але таксама рухомыя, часовыя. Адрыў з'явы ад сутнасці выкарыстоўваецца многімі ідэалістамі для абгрунтавання *агностыцызму*. І. Кант лічыў, што можна пазнаць толькі з'явы, што сутнасці рэчаў адгароджаны ад з'яў і таму непазнавальныя, кожная рэч ёсць «рэч у сабе». Махісты прадоўжылі агностычную лінію Канта. Само пытанне пра паво для іх кожная рэч зводзіцца да «комплексу адчуванняў». Агностычныя палажэнні капітыянцаў і махістаў абвяргаюцца даказанай у дыялектыцы сувяззю паміж З. і с. Самае рашучае абвяржэнне агностыцызму — грамадска-гістар. і пазнавальная практыка чалавецтва.

Літ.: Энгельс Ф. Людвіг Феербах і канец класічнай нямецкай філасофіі, Мн., 1953, разд. 2; Ленін У. І. Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм, Тв., т. 14, разд. 2, § 1 (Полн. собр. соч., т. 18, гл. 2, § 1); Яго ж. Філасофскія сшыткі, Тв., т. 38 (там жа, т. 29); Богданов Ю. А. Сущность и явление, Киев, 1962; Вахтомин Н. К. О роли категорий сущность и явление в познании, М., 1963.

А. С. Карлюк. Мінск.

ЗЯЗЮЛІ, зязюлі сапраўдныя (Cuculi), падатрад птушак атр. зязюлепадобных. Пашыраны на ўсім зямным шары, акрамя Арктыкі і Антарктыкі. 128 відаў, у СССР 6, на Беларусі — 3. звычайная (Cuculus canorus).



Зязюля звычайная.

Даўж. З. звычайнай каля 40 *см*, маса да 100 *г*. Аплрэнне зверху шэрае, цёмна-шэрае ці рыжаватае, знізу беларватае з цёмнымі папярочнымі палосамі. Пералётная птушка. Жыве у светлых лясах і хмызняках. Гнязда не робіць. Нясе 12—25 яец, якія па адным падкладвае ў чужыя (пераважна вераб'іных птушак) гнёзды (гнездавы паразітызм). Птушаня развіваецца за 11,5 сутак. Кукуе самец. Кормяцца З. насякомымі і іх лічынкамі. Карысныя лясной і с. гаспадарцы.

Літ.: Федюшин А. В. и Долбик М. С. Птицы Белоруссии, Мн., 1967 (бібліягр.); Птицы Советского Союза, т. 1, М., 1951; Жизнь животных, т. 5, М., 1970.

ЗЯЗЮЛІН ЛЕН, лугавы лён (Polytrichum), род сапраўдных імхоў сям. палітрыхавых. Вядома каля 100 відаў, пашыраных пераважна ў халодных і ўмераных абласцях зямнога шара. У СССР 13 відаў, на Беларусі 7.

Сцябло прамастойнае, выш. 2—40 *см*. Лісце цвёрдае, лінейна-ланцэтнае, шчыльна ўкрывае сцябло. На верхавінах некат. сцяблоў прызматычная гнёстая каробачка са спорамі. На Беларусі найб. вядомы З. л. звычайны (*P. commune*), які разрастаецца суцэльным дываном або вялікімі падушкамі і зменьвае водна-паветраны рэжым глебы, садзейнічае ле вабалочванню ў лясах, на сырых высечках і лугах. На вярховых, сфагнавых балотах пасля пажараў разрастаецца З. л. сціснуты — адзін з асн. торфаўтваральнікаў. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Мохападобныя*.

Літ.: Гл. пры арт. *Мохападобныя*.

ЗЯЗЮЛІНЫ СЛЁЗКІ, нар. назва многіх травяністых раслін з рабым лісцем пераважна з сям. *архідных*.

«ЗЯЗЮЛЯ», беларускі народны танец-гульня. Удзельнікі імітуюць крык зязюлі, ловяць адзін аднаго, кружацца парамі. Муз. памер $^2/_4$ або $^2/_8$.

Літ.: Романов Е. Р. Белорусский сборник, в. 7 — Белорусские народные мелодии, Вильна, 1910, с. 42; Анталогія беларускай народнай песні, Мн., 1968, с. 410; Federowski M. Lud białoruski, t. 6, Warszawa, 1960, с. 207.

ЗЯЗЮЛЯ Андрэй [сапр. Астрамовіч Аляксандр; 26.11.1878, в. Навасады Ашмянскага пав. Віленскай губ.— 17.1.1921), беларускі клерыкальны паэт. З сялян. Скончыў каталіцкую духоўную семінарыю (1910, Пецярбург). Служыў ксяндзом. Друкаваўся з 1910 у газ. «Наша ніва», потым у газ. «Biełarus», «Krynica». Аўтар зб. вершаў «З роднага загону» (1913, 1931), паэмы фальклорна-этнагр. складу «Аленчына вяселле» (Вільня, 1923). У паэзіі З. пераважаюць дыдакт.-маралізатарскія тэндэнцыі ў хрысц. духу. З А. *Грыневічам* выдаў зб. «Беларускія песні з нотамі» (1912, Пецярбург).

У. А. Калеснік. Брэст.

ЗЯЛЁНІН Дзмітрый Канстанцінавіч (21.10.1878, в. Люк Сарапульскага пав. Вяцкай губ.— 31.8.1954), савецкі этнограф, дыялектолаг, фальклярыст. Чл.-кар. АН СССР (1925), акад. Балг. АН (1946). Скончыў Юр'еўскі ун-т (1904). З 1916 праф. Харкаўскага, з 1925 Ленінградскага ун-таў. З 1926 у Ін-це этнаграфіі АН СССР. Аўтар даследаванняў па этнаграфіі, дыялекталогіі і фальклоры славянскіх (у т. л. беларускага) і неславянскіх народаў Расіі. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга.

Тв.: Русская соха, ее история и виды, Вятка, 1907; Библиографический указатель русской этнографической литературы о внешнем быте народов России 1700—1910 гг., СПб., 1913 (Записки имп. Русского геогр. об-ва по отделению этнографии, т. 40, в. 1); Великорусские говоры с неорганическим и переходным смягчением заднеязычных согласных в связи с течениями позднейшей великорусской колонизации, СПб., 1913; Russische (Ostslavische) Volkskunde, Berlin und Leipzig, 1927; Тотемы-деревья в сказаниях и обрядах европейских народов, М.—Л., 1937.

ЗЯЛЁНІЎНАЯ АГАРОДНІНА (зяленіва, зеляніна), група скараспелых адна- і шматгадовых агародніннных культур, якія вырошчваюцца на зяленіва і спажываюцца свежыя. Да іх належаць: *салата, шпінат*, крэс-салата, пекінская капуста (гл. *Капуста*), *цыбуля, кроп, сельдэрэй, пятрушка, шчаўе, спаржа, рэвень*, салатны цыкорый, *радыска* і інш. З. а. багатая на вітаміны і мінер. солі, мае вугляводы, арган. к-ты, азоцістыя рэчывы, тлушчы, ферменты. Ужываецца ў лячэбным харчаванні.

Вырошчваюць у адкрытым і ахоўным грунце, неваторую (цыбулю, сельдэрэй, пятрушку) дарошчваюць і выганяюць на зяленіва ўвосень і зімою.

Скараспеласць З. а. дае магчымасць атрымліваць некалькі ўраджаяў на год. З. а. патрабавальная да глебы і вільгаці. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Вітаміканосныя расліны* і пры адпаведных арт.

Літ.: Зеленные овощные культуры, Л., 1967; Ипатьев А. Н. Овощные растения земного шара, Мн., 1966; Советы огородникам, Мн., 1970.

М. А. Гарадзілаў. Самахвалавічы, Мінскі р-н.

ЗЯЛЁНАГА МЫСА АСТРАВЫ (Ilhas do Cabo Verde), група астравоў у Атлантычным ак., за 600 *км* на З ад Дакара. Калонія Партугаліі (афіцыйна «заморская правінцыя»). Пл. 4039 *км*², у т. л. а-воў Сант'ягу 996 *км*², Санту-Антан 780 *км*², Баавішта 606 *км*², Фогу — 486 *км*². Нас. 250 тыс. чал. (1969) — афрыканцы, мулаты, партугальцы. Адм. ц. Прая на в-ве Сант'ягу.

А-вы складзены з вулканічных парод. Выш. іх да 2829 *м* (дзейны вулкан Фогу на адпаведным в-ве). Клімат трапічны, пасатны. Ападкаў 250—300 *мм* за год, пераважна з жн. да кастр. Расліннасць паўпустынная. Шмат марскіх птушак, мора багата на рыбу. Зямля належыць партуг. памешчыкам. Вырошчваюць каву, клешчавіну, гарчыцу, цытрусавыя, цукр. трыснёг, кукурузу, бататы, боб. Невялікая колькасць буйн. раг. жывёлы, свіней і коз. Рыбалоўства. Здабыча солі, сыравіны для цэментавай прамысл., марскіх каралаў. Адзінкавыя прадпр. па апрацоўцы рыбы, вытворчасці мыла, алею, спірту. А-вы — важны транзітны пункт на шляхах з Еўропы ў Паўд. Амерыку і Афрыку (порт Мінделу на в-ве Сан-Вісенты, буйны аэрапорт на в-ве Сал). А-вы — прамежкавая ваен. база Партугаліі ў барацьбе супраць нац.-вызв. руху ў Анголе, Мазамбіку і інш. калоніях.

Адкрыты а-вы ў 1456 венецыянцам А. Кадамоста, які быў на службе ў партуг. прынца. З 1462 засяляліся партуг. каланістамі, неграмі-рабамі, вывезенымі з Сенегала, а таксама сасланымі сюды злачынцамі. З 1495 уладанне партуг. кароны. Пасля 2-й сусв. вайны на а-вах разгарнулася вызв. барацьба супраць партуг. каланізатараў. У 1956 створана Афр. партыя незалежнасці Гвінеі і а-воў Зялёнага Мыса, якая ўзначаліла вызв. рух. У чэрв. 1961 створаны Адзіны фронт вызвалення.

ЗЯЛЁНАЕ БУДАЎНІЦТВА, сістэма мерапрыемстваў па стварэнні, зберажэнні і выкарыстанні зялёных насаджэнняў для паляпшэння ўмоў жыцця насельніцтва; найважнейшы элемент добраўпарадкавання і арх.-маст. афармлення населеных пунктаў (гл. *Азеляненне*). З. б. ажыццяўляецца паводле спец. тэхн. праектаў. Шырока ўжываюцца камбінацыі з дрэўных, кустовых, травяністых, лісцева-дэкар. і кветкавых раслін, жывыя агароджы і вертыкальнае азеляненне павойнымі раслінамі. Гл. таксама *Дэкаратыўныя расліны, Кветкаводства, Садова-паркавае мастацтва*.

Літ.: Шкутко Н. В. и Чаховский А. А. Озеленение городов и населенных пунктов, Мн., 1965; Рубцов Л. И. Проектирование садов и парков, М., 1964; Иванов А. Ф. и Лысоконь П. Ф. Зеленые насаждения и уход за ними, Мн., 1957; Градостроительство. Озеленение и благоустройство городов, Киев, 1967.

ЗЯЛЁНАЕ ЎГНАЁННЕ, зялёная маса раслін, завораная ў глебу для павышэння ўрадлівасці. Асабліва эфектыўнае на пясчаных і супясчаных дзярнова-падзолістых глебах. На З. ў. сеюць пераважна бабовыя культуры: у БССР — лубін аднагадовы (жоўты і вузкалісты) і шматгадовы.

З. ў. абагачае глебу арган. рэчывамі, паляпшае яе фіз. якасці, спрыяе жыццядзейнасці глебавых мікраарганізмаў, павышае ўраджай першай культуры, пад якую заворваюць, і дзвюх наступных. Ужываецца як самастойнае (пасевы на папары) і прамежкавае (не займае асобнага поля) — падсяўное і паніышчавае. Найб. пашыраны пасевы шматгадовага лубіну як прамежкавай культуры. Яго падсяваюць да азімага жыта па замерзлай глебе або па снезе зімою. Пры заворванні на 1 *га* 300—400 *ц* зялёнай масы лубіну ў глебе назапашваецца 150—200 *кг* азоту (раўназначна 30—40 *т* гною).

Літ.: Алексеев Е. К. Зеленое удобрение в черноземной полосе, М., 1959; Алексеев Е. К., Рубанов В. С. и Довбан К. И. Зеленое удобрение, Мн., 1970.

В. С. Рубанаў. Жодзіна.

ЗЯЛЁНАКАМЕННЫЯ ПАРОДЫ, зборная назва змененых горных парод, афарбаваных у зялёны колер.

Прадукты нізкатэмпературнага метамарфізму пераважна сярэдніх і асноўных горных парод, эрэдку — ультраасноўных, глініста-карбанатных і інш. На месцы першасных мінералаў утвараюцца хларыт, ураліт, актыналіт, эпідот, альбіт, кварц, часткова тальк, карбанаты і інш. Найб. пашыраны на Д. Усходзе, Паўн. Каўказе, Урале.

ЗЯЛЁНАЯ, вёска ў Баранавіцкім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Ленінец». За 25 *км* на Пн ад Баранавіч, 231 *км* ад Брэста, на шашы Баранавічы — Навагрудак. 116 ж., гасп. 36 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін.

ЗЯЛЁНАЯ ДУБРОВА, вёска ў Жупранскім с/с Ашмянскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр саўгаса «Перамога». За 17 *км* на ПнУ ад Ашмян, 237 *км* ад Гродна, 0,5 *км* ад чыг. ст. Ашмяны. 41 ж., двароў 19 (1971). Санаторый.

ЗЯЛЁНКА (Tricholoma flavovirens), шапкавы базідыяльны грыб сям. радоўкавых. Шапка 4—11 *см* у дыяметры, у маладых грыбоў выпуклая, па краі лопасцева-раздзельная, з трэшчынкамі, у дарослых — пляскатая. Скурка ліпкая, жаўтавата-зеленаватая. Пласцінкі шырокія, серна-жоўтыя. Ножка 3—5 *см* даўж., цыліндрычная. На Беларусі З. расце пераважна ў хваёвых лясах у вер.— кастр. Ядомы грыб, спажываецца свежы, марынаваны, солены.



Літ.: Гл. пры арт. *Грыбы*.

ЗЯЛЁНКА, вёска ў Полацкім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Зялёнка». За 22 *км* на Пн ад Полацка, 122 *км* ад Віцебска. 303 ж., двароў 103 (1971). Швейнае атэлье, шавецкая майстэрня. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячыя яслі-сад, аддз. сувязі, сталовая, магазін. Музей баявой і прац. славы. Ням.-фаш. захопнікі расстралялі 52 мірных жыхароў, у лютым 1943 спалілі вёску.

ЗЯЛЁНКІН Міхаіл Міхайлавіч (н. 20.7.1920, ст. Рудзенск Мінскага пав.), Герой Сав. Саюза (1946). З рабочых. Чл. КПСС з 1943. Скончыў Мінскі аэраклуб (1939), Батайскую ваен. школу лётчыкаў (1941). У Айч. вайну на Калінінскім, Зах., 1-м і 2-м Бел. франтах — лётчык-знішчальнік. Збіў 28 варожых самалётаў і ў групавых баях 4. Чл. Саюза мастакоў СССР (1965). Жыве ў Мінску.



ЗЯЛЁНЫ БОР, рабочы пасёлак у Смалявіцкім р-не Мінскай вобл. Цэнтр пасялковага Савета. За 37 *км* на У ад Смалявіч, 75 *км* ад Мінска, 18 *км* ад чыг. ст. Жодзіна. 2 тыс. ж. (1971). Торфапрадпр. «Смалявіцкае», камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, школа рабочай і сельскай моладзі, клуб, б-ка, 2 дзіцячыя сады, дзіцячыя яслі, бальніца. 2 помнікі: на брацкай магіле сав. лётчыкаў Айч. вайны, на магіле сям'і партызана, якую ў ліст. 1942 расстралялі ням.-фаш. захопнікі.

ЗЯЛЁНЫ ВО́СТРАЎ, вёска ў Палянскім с/с Лепельскага р-на Віцебскай вобл., на р. Старобінка. Цэнтр калгаса «Ударнік». За 12 *км* на ПдУ ад Лепеля, 127 *км* ад Віцебска, на шашы Лепель — г. п. Халопенічы. 248 ж., двароў 67 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка; магазін. У 1942 вёску спалілі ням.-фаш. захопнікі.

ЗЯЛЁНЫ ДЗЯ́ЦЕЛ (Picus), род птушак сям. ўласна дзятлоў атр. *дзятлоў*. Жывуць у лясах Еўропы і Азіі. У СССР 3 віды, на Беларусі 2: уласна З. дз. (P. viridis) і *сівы дзяцел*.



Уласна зялёны дзяцел.

Маса З. дз., пашыраных у СССР, 186—250 *г*, даўж. дзюбы 3,7—4,6 *см*. Уласна З. дз.— самы вялікі прадстаўнік роду. Апярэнне ярка-зялёнае (верх галавы і патыліца чырвоныя). Трапляецца рэдка. Жыве ў высакаствольных, пераважна лісцевых лясах. Гняздуецца ў дуплах. Нясе 6—8 яец. Наседжвае 11—13 дзён. Корміцца насякомымі — шкоднікамі лесу, пчоламі, мурашкамі.

Літ.: Федюшин А. В. и Долбик М. С. Птицы Белоруссии, Мн., 1967 (бібліягр.).

ЗЯЛЁНЫ КАНВЕ́ЕР, сістэма планавай вытворчасці *зялёных кармоў* і бесперапыннага забеспячэння імі с.-г. жывёлы ад ранняй вясны да позняй восені.

Адрозніваюць тры тыпы З. к.: прыродны (выкарыстоўваюцца прыродная паша і атава сенажацяў), штучны (аднагадовыя культуры, сеяныя шматгадовыя травы і інш. кармавыя культуры, паржышчавыя і паўкосныя), мяшаны (прыродная паша і атава з сеянымі шмат- і аднагадовымі травамі і інш. кармавымі культурамі). Найб. пашыраны мяшаны тып З. к. Пры ўсіх тыпах ужываюць таксама адходы агародніцтва і буракаводства, сілас і інш. сакавітыя кармы. На Беларусі на З. к. выкарыстоўваюць прыродную і шматгадовую культурную пашу, сеяныя шматгадовыя травы (белая і чырвоная канюшына з цімафееўкай, райграсам пашавым і аўсяніцай) і аднагадовыя культуры (азімыя жыта і пшаніца, віка-аўсяная, гарохава-аўсяная і лубіна-аўсяная сумесі).

Літ.: Рогов М. С. и Новоселов Ю. К. Зеленый конвейер, М., 1969; Пиотрашко Л. А., Бушмакина Г. А. и Кузьминская О. И. Летнее содержание скота на культурных пастбищах, Мн., 1966.

В. Я. Краско. Жодзіна.

ЗЯЛЁНЫ ЛУГ, вёска на паўн. ускраіне Мінска. Цэнтр птушкафабрыкі «Зялёны Луг». За 10 *км* на Пн ад чыг. ст. Мінск, на шашы Мінск — Лагойск. 1040 ж., гасп. 198 (1971).

ЗЯЛЁНЫЯ ВО́ДАРАСЦІ (Chlorophyta), тып (аддзел) водарасцей, якія маюць зялёны колер ад наяўнасці пігменту хларафілу. Вядома каля 5700 відаў, аб'яднаных у 360 родаў.

Адна-, шматклетачныя, каланіяльныя і няклетачныя арганізмы, разнастайнай формы, рухомыя або прымацаваныя да субстрату. Клеткі маюць пекцінавую, цэлюлозна-пекцінавую або цэлюлозную абалонку. Запасное рэчыва — крухмал. Размнажаюцца З. в. полавым і бясполавым спосабамі. Падзяляюцца на 3 класы: сапраўдныя З. в., або раўнажгуцікавыя (Euchlorophyceae, або Isocontae), счаплянкі, або кан'югаты (Conjugatae), харавыя, ці лучыцы (Charophyta). Пашыраны З. в. пераважна ў планктоне і бентасе прэсных вадаёмаў, выклікаюць «цвіценне» вады, утвараюць ціну. Трапляюцца З. в. і ў морах (напр., сіфонавыя — амаль выключна марскія водарасці). Некат. прыстасаваліся да сухапутных умоў — жывуць на глебе, ствалах дрэў, скалах (плеўракок, трэнтэполія). Тыповыя прадстаўнікі З. в.— спірагіра, кладофара, *хларэла* і інш. З. в.— корм водных жывёл. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Водарасці*.

Літ.: Гл. пры арт. *Водарасці*.

Н. І. Срэценская. Мінск.

ЗЯЛЁНЫЯ КАРМЫ́, травяністая расліннасць лугоў і пашы або скошаная маса, якая ідзе на корм с.-г. жывёле. Асн. від корму ў пашавы перыяд. Добра ператраўляюцца жывёлаю. Багатыя на бялкі, мінер. солі і вітаміны. Асабліва каштоўныя як крыніца караціну (у маладой траве бабовых да 100 *мг/кг*).

Сухое рэчыва маладой травы пажыўнасцю набліжаецца да сухога рэчыва *канцэнтраваных кармоў*. Асн. крыніца З. к.— прыродная і штучная паша, на якой жывёла атрымлівае каля 90% летняга корму. Калі не хапае пашы, на З. к. вырошчваюць *кармавыя травы*. У пачатку пашавага сезона выкарыстоўваюць азімыя жыта і пшаніцу, увосень — кармавую капусту, бацвінне цукровых і кармавых буракоў, інш. караняплодаў.

Літ.: Томмэ И. Ф. Корма СССР, 4 изд., М., 1964; Новые данные химического состава и питательности кормов Белорусской ССР, Мн., 1969; Лемеш В. Ф., Шпаков А. П. и Назаров В. К. Кормовые нормы и таблицы, Мн., 1966.

В. Я. Краско. Жодзіна.

ЗЯЛІ́НСКІ Мікалай Дзмітрыевіч [25.1(6.2). 1861, Ціраспаль Херсонскай губ.— 31.7.1953], савецкі хімік-арганік. Акад. АН СССР (1929, чл.-кар. 1924). Герой Сац. Працы (1945). З 1893 і да канца жыцця (акрамя 1911—17) праф. Маскоўскага ун-та. Стваральнік і кіраўнік школы сав. хімікаў. Класічныя працы З. ў галіне арган. каталізу. Распрацаваў метады атрымання з нафты каштоўных вуглевадародаў, якія служаць сыравінай для сінтэзу фарбавальнікаў, штучных каўчукаў, пластмас, медыкаментаў і інш. Правёў даследаванні па хіміі бялку і гэтым пашырыў веды пра іх будову. У 1916 стварыў вугальны процівагаз. Дзярж. прэміі СССР 1942, 1946, 1948. Узнаг. 3 ордэнамі Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі.



Тв.: Собрание трудов, т. 1—4, М., 1954—60; Избр. труды, М., 1968 (біягр.).

Літ.: Николай Дмитриевич Зелинский, М.— Л., 1946 (Материалы к биобиблиогр. ученых СССР); Нилов Е. Зелинский, М., 1964.

ЗЯЛЬДО́ВІЧ Якаў Барысавіч [н. 23.2(8.3). 1914, Мінск], савецкі фізік. Акад. АН СССР (1958, чл.-кар. 1946). Працаваў у Ін-це хім. фізікі АН СССР (1931—48), у Ін-це тэарэт. і эксперым. фізікі (1948—62). З 1962 у Ін-це прыкладной матэматыкі АН СССР. У першых навук. працах па хім. фізіцы развіў тэорыю



адсорбцыі на неаднароднай паверхні і тэорыю каталізу порыстымі рэчывамі. Распрацаваў (1938—43) тэорыю гарэння і дэтанацыі газаў, высветліў (з супрацоўнікамі) механізм акіслення азоту пры гарэнні і выбухах. З Ю. Б. *Харытонам* даў разлік ланцуговай рэакцыі дзялення урану. Аўтар прац па тэорыі ўдарных хваляў і газадынаміцы. У 1952—60 вёў даследаванні па элементарных часцінках, з 1962 пераважна па астрафізіцы і касмалогіі (катастрафічныя працэсы ў зорках, эвалюцыя Сусвету). Дзярж. прэмія СССР 1943.

Тв.: (З А. С. Кампанейцам) Теория детонации, М., 1955; (з Ю. П. Райзерам) Физика ударных волн и высокотемпературных гидродинамических явлений, 2 изд., М., 1966; (з І. Дз. Новікавым) Релятивистская астрофизика, М., 1967; Высшая математика для начинающих и ее приложения к физике, 5 изд., М., 1970.

Літ.: Смородинский Я. А. и Франк-Каменецкий Д. А. Яков Борисович Зельдович, «Успехи физических наук», 1964, т. 82, в. 3 (спіс прац З.).

ЗЯМЕ́ЛЬНАЕ ПРА́ВА, галіна савецкага сацыяліст. права, што рэгулюе адносіны па выкарыстанні зямлі як дзярж. уласнасці. Вызначае ўмовы, парадак і формы выдачы зямлі землекарыстальнікам, іх правы і абавязкі, спрыяе рацыянальнаму выкарыстанню зямлі, замацоўвае сацыяліст. землекарыстанне.

Абавязковым удзельнікам зямельных адносін ва ўсіх выпадках з'яўляецца дзяржава, аснова адносін — дзярж. ўласнасць на зямлю (гл. *Адзіны дзяржаўны зямельны фонд*). СССР і саюзныя рэспублікі ў асобе адпаведных органаў дзярж. улады і кіравання ажыццяўляюць права распараджацца і кіраваць зямлёю. З. п. складаецца з агульнасаюзнага і рэсп. заканадаўстваў. Асн. крыніцы З. п.: Канстытуцыя СССР, канстытуцыі саюзных і аўт. рэспублік, асновы зямельнага заканадаўства Саюза ССР і саюзных рэспублік, зямельныя кодэксы саюзных рэспублік (гл. *Зямельны кодэкс Беларускай ССР*). З. п. ўключае таксама воднае, горнае, лясное заканадаўствы. Гл. таксама *Землеўладанне, Калгаснае права*.

Літ.: Дегтярев И. В. и Осипов Л. И. Земельное право и учет земель, М., 1970; Дмитренко И. А. Охрана земельных прав колхозов, Днепропетровск, 1969; Жариков Ю. Г. Охрана почв — обязанность землепользователей, М., 1965.

М. В. Сторажаў. Мінск.

ЗЯМЕ́ЛЬНАЯ РЭ́НТА, у класаваантаганістычных фармацыях частка прыбавачнага прадукту, які ствараецца працаю непасрэдных вытворцаў і прысвойваецца ўласнікам зямлі.

Феадалізму ўласцівыя 3 формы З. р.: 1) адработачная рэнта, ці *паншчына*; 2) рэнта прадуктамі, ці *аброк*; 3) грашовая рэнта. Капіталіст. З. р.— лішак прыбавачнай вартасці над сярэднім прыбыткам. Ствараецца неаплачанай працаю наёмных рабочых. Выражае адносіны землеўладальнікаў, капіталістаў-арандатараў і наёмных рабочых. Адрозніваюць *дыферэнцыяльную рэнту*, абсалютную і манапольную З. р. Прычына абсалютнай З. р.— манаполія прыватнай уласнасці на зямлю, умова — розніца арганічнай будовы капіталу ў прамысловасці і ў с. гасп. У с. гасп., дзе арганічная будова капіталу ніжэйшая, чым у прамысловасці, на адзінку капіталу ствараецца больш прыбавачнай вартасці, чым у прамысловасці, утвараецца прыбытак, большы за сярэдні. Манаполія прыватнай уласнасці на зямлю перашкаджае пераліву капіталу з прамысловасці ў с. гасп., таму с.-г. прадукцыя прадаецца па вартасці, якая перавышае цану вытворчасці. Гэты дадатковы прыбытак капіталіст-арандатар аддае ў форме З. р. землеўладальніку. Пад уздзеяннем тэхн. прагрэсу ў краінах развітага капіталізму адбываецца паступовае збліжэнне арганічнага саставу капіталу ў прамысловасці і с. гаспадарцы. На гэтай аснове ўзнікае тэндэнцыя да зніжэння нормы і масы абсалютнай З. р. Аднак роля манаполіі прыватнай уласнасці на зямлю не страціла свайго эканам. значэння. Яна вядзе да павышэння цэн на с.-г. прадукцыю, што з'яўляецца асновай абсалютнай З. р. Манапольная З. р.— адна з формаў З. р. пры капіталізме, дадатковы прыбытак, які атрымліваецца ад продажу тавараў па манапольнай цане, г. зн. большай за яго вартасць і цану вытворчасці. Атрымліваецца на землях, дзе вырошчваюцца культуры асаблівай якасці, здабываюцца каштоўныя мінералы, руды і г. д. З ліквідацыяй манаполіі прыватнай уласнасці на зямлю абсалютная З. р. знікае.

Літ.: Маркс К. Капітал, т. 3, Мн., 1953, аддз. 6; Ленін У. І. Аграрнае пытанне і «крытыкі Маркса», Тв., т. 5 (Полн. собр. соч., т. 5); яго ж. Новыя даныя аб законах развіцця капіталізму ў земляробстве, Тв., т. 22 (там жа, т. 27); яго ж. Аграрная праграма сацыял-дэмакратыі ў першай рускай рэвалюцыі 1905—1907 гг., Тв., т. 13 (там жа, т. 16); Брегель Э. Я. Земельная рента. Развитие капитализма в сельском хозяйстве, М., 1962; Кагарлицкая О. Т. Земельная рента, Л., 1961; Козодоев И. И. Земельные отношения в социалистических странах, М., 1960; Раков Я. Г. Дифференциальная рента при социализме, Мн., 1963.

Я. Г. Ракаў. Мінск.

ЗЯМЕ́ЛЬНЫ КАДА́СТР, сукупнасць звестак пра гаспадарчае, прыроднае і прававое становішча зямель. Уключае: дзярж. рэгістрацыю землекарыстанняў, колькасны ўлік і якасную характарыстыку зямель, баніціроўку глебаў (гл. *Баніціроўка*) і эканам. ацэнку зямель.

Найб. важная частка З. к.— эканам. ацэнка зямель, г. зн. параўнальная іх каштоўнасць у розных прыродна-кліматычных зонах. З. к. ужываецца пры планаванні нар. гасп., эфектыўнага выкарыстання зямель і іх аховы, пры размяшчэнні і спецыялізацыі с.-г. вытворчасці, меліярацыі зямель, хімізацыі с. гасп. і г. д. Вядзецца па адзінай для СССР сістэме.

Літ.: Черемушкин С. Д. и др. Экономическая оценка земли, М., 1961; Зиночкин А. Г. Экономическая оценка сельскохозяйственных угодий, М., 1963; Медведев А. Г. и др. Экономическая оценка земель, Мн., 1966; Чернявский И. Т. и Суровый Л. Н. Экономическая оценка земель и внедрение хозрасчета в колхозах, Мн., 1962.

М. П. Трубілка. Мінск.

ЗЯМЕ́ЛЬНЫ КО́ДЭКС БЕЛАРУ́СКАЙ ССР, сукупнасць юрыд. нормаў, якія рэгулююць зямельныя адносіны. Першы З. к. БССР прыняты ў 1923 (на ўзор З. к. РСФСР 1922), другі — у 1925. У іх былі замацаваны нормы карыстання зямлёю працоўнымі сялянамі, а таксама льготы грамадскім землекарыстальнікам. Дзейны З. к. БССР прыняты ў адпаведнасці з асновамі зямельнага заканадаўства Саюза ССР і саюзных рэспублік Вярх. Саветам БССР 24.12.1970 (уведзены ў дзеянне 1.7.1971).

У З. к. БССР 11 раздзелаў, якія вызначаюць структуру адзінага зямельнага фонду і кампетэнцыю БССР у рэгуляванні зямельных адносін; парадак і формы *землекарыстання* (асабліва калгасамі і саўгасамі); правы і абавязкі землекарыстальнікаў; рэгламентуюць парадак вядзення *зямельнага кадастра*, землеўладкаванне, ахову зямель і павышэння ўрадлівасці глебы, а таксама змяшчаюць пералік зямельных правапарушэнняў, за якія прадугледжваецца крымін. або адм. адказнасць. Са-

дзейнічае ўмацаванню сацыялістычнага заканнасці ў галіне зямельных адносін, забяспечвае ахову прававой сацыялістычнага грамадзян. Гл. таксама *Зямельнае права*.

Кр.: Зямельны кодэкс Беларускай ССР. Мн., 1971. *М. В. Сторажаў.* Мінск.

ЗЯМКЕВІЧ Рамуальд Аляксандравіч (псеўд. Раман Суніца, Юры Алелькавіч; 7.2.1881, Варшава — 1943 ці 1944), беларускі бібліяфіл, бібліёграф, публіцыст і гісторык бел. л-ры. Сын заг. друкарні (бацькі родам з Случчыны). Друкаваўся з 1909 у «Нашай ніве». У 1909—11 пераклаў і надрук. там 10 навел укр. пісьменніка В. Стафаніка. Даследаваў бел. бібліяграфію, стараж. бел. л-ру, бел. л-ру 19 ст. [арт. «Вінцук Дунін-Марцінкевіч, яго жыццё і літаратурнае значэнне», «Беларуская бібліяграфія», 1910; «Ян Неслухоўскі (Янка Лучына) і яго нявёдамыя вершы»; 1932, і інш.], этнаграфію. Сабраў вял. калекцыю рукапісаў бел. пісьменнікаў, этнагр. экспанатаў (загінулі ў Айч. вайну). Апубл. невядомыя рукапісы М. Багдановіча (1919), К. Каганца (1920), Я. Лучыны (1932).

Тв.: Ян Баршчэўскі, першы беларускі пісьменнік XIX стагоддзя, Вільня, 1911; Адам Ганоры Кіркор, Вільня, 1911; Тарас Шаўчэнка і беларусы, у кн.: Тарас Шаўчэнка і беларуская літаратура, Мн., 1964. *І. У. Саламевіч.* Мінск.

ЗЯМЛЯ, трэцяя ад Сонца планета *Сонечнай сістэмы*. [На ўклейках: фіз. карта свету, фатаграфія З. з космасу].

Агульныя звесткі. Фігура З.— *геоід* — блізкая да паверхні эліпсоіда вярчэння, у якога экватарыяльны радыус роўны 6 378 245 *м*, а палярны — 6 356 863 *м* (гл. *Красоўскага эліпсоід*). Плошча паверхні З.— $510 \cdot 10^6$ *км*² (з іх 29,2% сушы), аб'ём — $1{,}083 \cdot 10^{12}$ *км*³, маса $5{,}976 \cdot 10^{24}$ *кг*. Паскарэнне сілы цяжару на паверхні З. складае 978,049 *см/сек*² на экватары, 983,235 *см/сек*² на полюсах (гл. таксама *Гравіметрыя*). Разам з Сонечнаю сістэмаю З. рухаецца вакол галактычнага ядра, верціцца вакол *Сонца* паводле *Кеплера законаў* (адзін абарот за *год*) і вакол уласнай восі (адзін абарот за *суткі*); павольна зменьвае напрамак восі вярчэння з прычыны *прэцэсіі* і *нутацыі*. Нахілам восі вярчэння З. да плоскасці арбіты — *эклі́птыкі* — тлумачыцца змена *пораў года*. З. акружана *атмасферай*. Вонкавыя вобласці атмасферы ўключаюць т. зв. *радыяцыйныя паясы Зямлі*. Галоўная крыніца энергіі для большасці з'яў, якія адбываюцца на паверхні З.,— сонечнае выпраменьненне. З. мае натуральны спадарожнік — Месяц. Узрост З. паводле касмаганічных тэорый лічыцца з моманту стварэння яе як ізаляванай сістэмы, па сучасных вызначэннях — каля 4—5 млрд. гадоў.

Паходжанне. Паходжанне і развіццё З. пачалі вывучаць яшчэ старажытныя філосафы і астраномы (Піфагор, Арыстоцель, Арыстарх і інш.). Першую навук. гіпотэзу пра ўтварэнне ўсіх планет Сонечнай сістэмы з воблака распаленай пылавой матэрыі выказаў у 1755 ням. філосаф І. Кант. У 1796 франц. матэматык П. Лаплас апублікаваў касмаганічную гіпотэзу пра ўтварэнне Сонечнай сістэмы з газавай туманнасці, якая паступова ахалоджвалася і сціскалася. Вял. ўвагу прыцягнула гіпотэза сав. вучонага О. Ю. Шміта (1944), паводле якой планеты, у т. л. З., утварыліся з раздробненага пылавога воблака пры сутыкненні пад дзеяннем сілы ўзаемнага прыцяжэння цвёрдых часцінак, што паступова кандэнсаваліся і ўтваралі згусткі. З. была спачатку халоднай і разагрэлася ад радыеактыўнага распаду элементаў у ле нетрах. Існуе таксама касмаганічная гіпотэза В. Р. Фясенкава, паводле якой Сонца на першых стадыях свайго існавання было масіўнай воркай, якая хутка вярцелася і была акружана газава-пылавым асяроддзем. У выніку эвалюцыі згусткі газава-пылавой туманнасці ўтварыліся планеты і З. Праблема ўтварэння цэлай Сонечнай сістэмы не вырашана (гл. *Астраномія, Касмагонія, Сістэмы свету*).

Унутраная будова і геалагічная гісторыя. Паводле сучасных уяўленняў З. складаецца з *зямной кары, мантыі Зямлі, ядра Зямлі* (гл. рыс.), якія розняцца фіз. і хім. саставам. Мяркуюць, што шчыльн. унутры ядра да 17 900 *кг/м*³, ціск каля 0,34 *Тн/м*²



Схема ўнутранай будовы Зямлі:
1 — зямная кара;
2 — верхняя мантыя;
3 — ніжняя мантыя;
4 — вонкавае ядро;
5 — унутранае ядро.

(3,5 млн. *ат*), т-ра да 4000 °С. Сярэдняя шчыльнасць З. каля 5520 *кг/м*³. У хім. адносінах большую ч. масы З. складаюць (у %): кісларод — 34,6; жалеза — 25,8; крэмній — 17,8; магній — 13,9; астатнія элементы — 7,9. Зямная кара складзена з асадкавых і магматычных парод, аддзелена ад мантыі паверхняй Махаровічыча. Магутнасць зямной кары ад 5—10 *км* у акіянах да 40—70 *км* на кантынентах. Ёй уласціва слаіста-блокавая будова, абумоўленая глыбінными разломамі і гарызантальнымі межамі. Мантыя З. паглыбляецца да 2900 *км*. Яе аб'ём — каля 80% аб'ёму ўсёй З. Складзена з пород ультраасноўнага саставу. Вылучаюць верхнюю (да 1000 *км*) і ніжнюю мантыі. Рэчыва мантыі пеража цвёрдае. На глыб. ад 100 да 400 *км* рэчыва ў размякчаным стане. Тут утвараюцца ачагі *магмы*, якія жывяць вулканы. У мантыі сканцэнтраваны рэчыва і энергія, з якімі звязаны тэктанічныя працэсы, *землетрасенні, вулканізм*, утварэнне радавішчаў карысных выкапняў. Ядро З. падзяляецца лічыць, што рэчыва вонкавага ядра паводле фіз. стану набліжаецца да вадкасці, унутранае — цвёрдае. Ёсць меркаванне, што ядро — жалеза-нікелевае ці жалеза-крэмніевае. У вонкавым ядры існуюць сістэмы эл. токаў, якія ўтвараюць эл.-магнітнае поле З. (гл. таксама *Зямны магнетызм*). Развіццё З. і зямной кары абумоўлена геал. працэсамі, якія адбываюцца пад уздзеяннем унутраных (эндагенных) і вонкавых (экзагенных) сіл. Ад узаемадзеяння гэтых сіл зменьваюцца клімат, контуры мацерыкоў, пашырэнне мораў і акіянаў, кірункі цячэнняў рэк і інш. Геал. гісторыю З. вывучаюць па горных пародах, формах іх залягання і рэштках выкапнёвых арганізмаў. Гісторыя З. падзяляецца на эры — архейскую, пратэразойскую, палеазойскую, мезазойскую і кайназойскую (гл. адпаведныя арт., а таксама *Геалагічнае летазлічэнне* і *Гістарычная геалогія*).

Геаграфічныя асаблівасці. Над паверхняй Сусв. акіяна суша вылучаецца буйнымі масівамі мацерыкоў: Еўропа і Азія, Афрыка, Паўн. Амерыка, Паўд. Амерыка, Аўстралія, Антарктыда (гл. *Мацерыкі*). $100{,}5 \cdot 10^6$ *км*² сушы размешчана ў паўн. паўшар'і; у паўд. паўшар'і $48{,}5 \cdot 10^6$ *км*². Сярэдняя вышыня сушы 875 *м*, макс. 8848 *м* (г. Джамалунгма). Найб. плошчу на мацерыках ($48{,}2 \cdot 10^6$ *км*²) займаюць нізіны (0—200 *м* над узр. м.). Узвышшы і плато (200—500 *м* над узр. м.) размеркаваны на плошчы $33 \cdot 10^6$ *км*². Горы (вышэй за 500 *м*) займаюць астатнюю ч. сушы, але горы вышэй за 2000 *м* займаюць толькі $16 \cdot 10^6$ *км*². Каля 800 тыс. *км*² сушы ляжаць ніжэй узр. мора (дэпрэсіі). Яны размешчаны ў *бяссцёкавых абласцях* мацерыкоў. Сусв. акіян падзяляецца на часткі: Вялікі, або Ціхі, Атлантычны, Індыйскі, Паўн. Ледавіты акіяны (гл. адпаведныя арт.). Сярэдняя глыб. Сусветнага ак. 3800 *м*, максімальная (Марыянская ўпадзіна) 11 022 *м*. Дно акіяна паводле глыбіні падзяляецца на шэльф, ці мацерыковую водмель (глыб. 0—200 *м*), і мацерыковы схіл (глыб. да 3600 *м*), абмежаваны мацерыковым падножжам. Ніжэй ляжыць складанае ложа Сусв. акіяна з глыбакаводнымі (глыбей 6000 *м*) упадзінамі, ці жалабамі (гл. *Жалабы глыбакаводныя*), якія займаюць каля 1% паверхні З. Шматлікія падводныя хрыбты чаргуюцца з паніжанымі і платопадобнымі прасторамі. У размеркаванні мацерыкоў і акіянаў адзначаюцца заканамернасці. Мацерыкі ўтвараюць паўночны (Еўропа, Азія, Паўн. Амерыка) і паўднёвы (Паўд. Амерыка, Афрыка, Аўстралія) рады. Паўн. мацерыкі распаўсюджваюцца ад тропікаў да субпалярных шырот, паўднёвыя — не выходзяць за межы субтрапічных шырот і выдаюцца клінам на Пд. Мацерыкі і акіяны размяшчаюцца як антыподы: Ледавіты — Антарктыда; Паўн. Амерыка — Індыйскі ак.; Афрыка, Еўропа і Азія — Ціхі акіян. Мерыдыянальныя планетарныя формы рэльефу цягнуцца S-падобна: Кардыльеры, Анды, падводны Атлантычны хрыбет, усх. ўзбярэжжа Азіі і Аўстраліі. Найб. значныя сярэднія і макс. вышыні характэрны вялікім мацерыкам. Носьбітам найбольш яркіх прыродных асаблівасцей З. з'яўляецца *геаграфічная абалонка* (геасфера), магутнасць якой не перавышае 40 *км*. У *геасферы* сутыкаюцца і ўзаемадзейнічаюць *літасфера, гідрасфера, атмасфера* і *біясфера*. Геасфера — месца гасп. дзейнасці чалавека (гл. *Тэхнасфера*). З-за шарападобнасці З. геаграфічная абалонка мае шыротную занальнасць, якая выяўляецца ў цеплавых паясах і ў іх кліматычных адрозненнях (гл. *Клімат*). Ей характэрны праўленні азанальнасці, вышынная пояснасць у гарах, кругавароты рэчыва і энергіі, фарміраванне і развіццё ландшафтаў. Паверхня З. пастаянна зменьвае аблічча ад дзеяння натуральных сіл прыроды і гасп. дзейнасці чалавека.

Жыццё, яго эвалюцыя і сучасныя формы. Неад'емная частка верхняй абалонкі З.— біясферы — мікраарганізмы, расліны і жывёлы, якія насяляюць глебу, ваду, паветра.

За многія мільёны гадоў эвалюцыі жывыя істоты пристасаваліся да розных умоў існавання. Жыццё зарадзілася ў акіяне больш за 2 млрд. гадоў назад (архейская эра). Складаныя біяхім. рэакцыі далі бясформенныя структуры, якія развіваліся потым у аднаклетачныя арганізмы — *сінезялёныя водарасці* (пратэразойская эра). Водарасці далі пачатак усяму раслінаму свету (гл. *Расліны*). Ад першых водарасцепадобных аднаклетачных амёб паходзяць і *жывёлы*. У адкладах верхняга пратэразою асталіся рэшткі *радыялярый, губак, членістаногіх*, беззамковых брахіяподаў (гл. *Брахіяподы*) і інш. У кембрыйскіх пластах ёсць рэшткі прадстаўнікоў амаль усіх тыпаў беспазваночных; у морах былі асабліва пашыраны *археацыяты*, трылабіты і плечаногія. У ардовікскі і сілурыйскі перыяды ў морах існавалі ўсе групы раслін (водарасці) і жывёл, якія жылі ў кембрыі (больш за 15 тыс. відаў беспазваночных). У канцы сілуру паяўляюцца сапраўдныя рыбы (група панцырных, гл. *Рыбы*). На сушы ў кембрыі паяўляюцца першыя расліны. У сярэдзіне дэвону на мацерыках паяўляюцца лясы з дрэвападобных спаравых, дзеразовых, хвашчовых, папарацевых. Ад кісцяпёрых рыб пайшлі першыя наземныя чацвераногія жывёлы — *стэгацэфалы*. У каменнавугальным перыядзе паяўляюцца першыя голанасенныя расліны, шматлікія насякомыя: павукі, стракозы, прусакі, а таксама *паўзуны*, якія пад канец трыясу робяцца найб. пашыранымі жывёламі на З. Моры дэвону, карбону, пярмі насяляюць ганіятыты, брахіяподы, чатырохпрамянёвыя каралы і інш. У юрскі перыяд у морах пераважаюць *аманіты* і *белемніты*, паяўляюцца дыятомавыя водарасці, пашыраюцца водныя паўзуны (*іхтыязаўры*, плезіязаўры). Развіццё голанасенных, вільготны цёплы клімат стварылі спрыяльныя ўмовы для шырокага развіцця наземных паўзуноў, асабліва групы *дыназаўраў*. Мяркуюць, што ў гэты час ад паўзуноў узніклі *птушкі* (гл. *Археаптэрыкс*). У юрскі перыяд паявіліся першыя пакрытанасенныя расліны і першыя *млекакормячыя*. У сярэдзіне мелу на сушы голанасенныя замянялюцца пакрытанасенныя (дуб, клён і інш.). У канцы мелу выміраюць дыназаўры, марскія паўзуны, аманіты, белемніты і інш. У морах палеагену асабліва шматлікія *фарамініферы*, двухстворкі, *марскія вожыкі*. З рыб пераважаюць прамяняпёрыя. На сушы першае месца занялі млекакормячыя (першыя хобатныя, няпарнакапытныя, драпежныя, прыматы і інш.). У неагене родавы і відавы склад жывёл і раслін набліжаецца да сучаснага. На сушы пераважаюць пакрытанасенныя, у пачатку неагену паявіліся сучасныя сям. і роды: драпежныя, капытныя, хобатныя. У сярэдзіне неагену — свінні, алені, жырафы, каты, мастадонты, чалавекападобныя малпы; у канцы — сланы, гіпарыёны, сапраўдныя коні. На працягу чацвярцічнага перыяду сфарміравалася сучасная флора і фаўна, палвіўся *чалавек*. Расліны і жывёлы — 2 асн. аддзелы («царствы») арганічнага свету З. На З. агульная колькасць відаў раслін 500 тыс. З іх каля паловы — пакрытанасенныя, 89 тыс.— грыбы, 23 тыс.— мохападобныя, 21 тыс.— водарасці. З 250 тыс. вышэйшых кветкавых раслін 2558 відаў выкарыстоўваецца чалавекам на яду, у т. л. 546 агародніных, 261 караняплодных, 83 вернебабовых, 74 верневых злакаў. З дзікарослых найб. каштоўныя лекавыя, эфіраалейныя, цукра-інулінаносныя, фарбавальныя, ядомыя расліны. Жывёльны свет займае важнае месца ў біясферы З. Уапіклы ў акіяне каля 1,5 млрд. гадоў назад ад агульных з раслінамі продкаў, жывёлы выйшлі на сушу, а птушкі і многія насякомыя прыстасаваліся да палёту ў паветры. На З. 1,5—2 млн. відаў жывёл. Штогод вучоныя апісваюць каля 10 тыс. новых формаў, пераважна насякомых. Апісана насякомых 1 млн. відаў, прасцейшых 15—30 тыс., кішачнаполасцевых і губак 13 тыс., чарвей 25 тыс., малюскаў 80—100 тыс., ракападобных 20—25 тыс., павукападобных 26 тыс., мнаганожак 8 тыс., ігласкурых 4—5 тыс., рыб 20 тыс., земнаводных 2 тыс., паўзуноў 4 тыс., птушак 9 тыс., млекакормячых 4 тыс. відаў. Гіганты сярод жывёл даслаюць 30 *м* даўжыні і масы ў 150 *т* (сіні кіт). У жыцці чалавека вялікая роля належыць свойскім, паляўніча-прамысловым відам, відам, якія выкарыстоўваюцца ў медыцыне, а таксама шкодным жывёлам (драпежнікам, паразітам, шкоднікам с. гасп., пераносчыкам узбуджальнікаў хвароб і інш.).

Асноўныя этапы развіцця чалавека і грамадства. Эвалюцыя чалавека (гл. *Антрапагенез*) пачалася каля 2 млн. гадоў назад. Пачатак прыстасавальнай працоўнай дзейнасці ў чалавекападобных малпаў, якія карысталіся рознымі прыроднымі рэчамі (палкамі, камянямі) як прыладамі працы, лёг у аснову развіцця свядомай прац. дзейнасці. Выраб штучных прылад працы супадае з узнікненнем стараж. людзей і пачаткам станаўлення чалавека як віду і сац. істоты.

Вылучаюць 4 стадыі эвалюцыі чалавека: стадыя папярэдніка, да якой адносяцца *аўстралапітэкі*, ім характэрна перадпрацоўная дзейнасць; стадыя самага стараж. чалавека — архантрапа, якая пачынаецца з *пітэкантрапаў, сінантрапаў, атлантрапаў, гейдэльбергскага чалавека* і інш.; стадыя стараж. чалавека — палеаантрапа, да якой належаць усе *неандэртальцы*; стадыя чалавека сучаснага віду — неаантрапа, прадстаўленая ўсімі формамі чалавека сучаснага віду — Homo sapiens (чалавек разумны) — як выкапнёвымі (Homo sapiens fossilis), звязанымі з культурамі каменнага веку, так і тымі, што жывуць цяпер (Homo sapiens recens). На стадыі архантрапаў замест біял. згуртавання малпаў паяўляецца раннія форма згуртавання — першабытны чалавечы статак, пач. ступень першабытнаабшчыннага ладу. Яна супадае з перыядам ранняга *палеаліту* (дашэлем, шэлем, раннім ашэлем) і характарызуецца прымітыўнай тэхнікай апрацоўкі каменных прылад. Архантрапы жылі малымі ізаляванымі калектывамі ў цёплых кліматычных умовах, займаліся паляваннем, збіральніцтвам і амаль поўнасцю залежалі ад прыроды. Стадыя палеаантрапаў супадае з 2-й пал. ашэлю — пач. мусцьерскай эпохі, што адпавядае ранняй пары максімальнага абледзянення. Людзі сталі пастаянна сяліцца ў пячорах, штучна здабываць агонь, рабіць адзенне са скур жывёлы, ужываць кідаль-

ныя прылады працы. Палеаантрапы былі разнародныя паводле марфалагічнага тыпу: разам з прымітыўнымі формамі, блізкімі да архантрапаў, былі і такія, што ў сваім развіцці набліэіліся да чалавека сучаснага віду.

У канцы позняга палеаліту закончыўся працэс фарміравання чалавека як віду (стадыя неаантрапа) і станаўлення чалавечага грамадства. У гэты час значна паскараецца ўдасканаленне тэхнікі апрацоўкі каменных прылад, паяўляюцца прылады працы з косці і дрэва, штучна пабудаванае наземнае і паўзямлянкавае жытло, значна развіваецца паляванне і рыбалоўства, паяўляецца мастацтва. Рост прадукцыйных сіл і паляпшэнне ўмоў існавання садзейнічалі росту насельніцтва і паступоваму рассяленню яго на новыя тэр. Паўн. Еўропы і Азіі. У позпім палеаліце людзі засялілі Амерыку, праніклі ў Аўстралію. У сувязі з пашырэннем першапачатковага арэалу рассялення ў гэты час пад уплывам розных прыродных умоў адбылася расавая дыферэнцыяцыя чалавецтва (гл. *Расы*). Зонай фарміравання Homo sapiens'а лічаць Пярэднюю Азію і Паўд.-Усх. Еўропу. Закончыўся працэс фарміравання чалавека як вытворчай сілы, і яго марфалагічная арганізацыя больш не ставіла перашкод для неабмежаванага развіцця пазнання і практыкі і таму асталася амаль нязменнай да нашага часу. Кліматычныя, геаграфічныя і сац. ўмовы спрыялі ранняму ўзнікненню земляробства і жывёлагадоўлі ў Пярэдняй Азіі, Егіпце, Індыі і інш. Тут ужо ў позпім неаліце сфарміраваліся цывілізацыі з развітым рамяством, гандлем, гарадамі, рэлігіяй і пісьменнасцю, дзярж. уладай і класавым падзелам грамадства. Далейшыя этапы развіцця чалавечага грамадства гл. ў арт. *Першабытнаабшчынны лад, Рабаўладальніцкі лад, Феадалізм, Капіталізм, Сацыялізм, Камунізм.*

Насельніцтва. Агульная колькасць насельніцтва З. ў 1969 — 3552 млн. чал. У чатырох найбольшых краінах (Кітай, Індыя, СССР, ЗША) сканцэнтравана каля паловы чалавецтва. Больш за 1,2 млрд. чал. жыве ў сацыяліст. краінах, больш за 600 млн. чал.— у развітых капіталістычных і больш за 1,6 млрд.— у краінах, якія развіваюцца (асн. звесткі пра насельніцтва З. гл. ў табл. 1). Усе краіны паводле асаблівасцей натуральнага прыросту насельніцтва можна падзяліць на дзве групы. Развітыя ў прамысл. адносінах краіны з высокай доляй гарадскога насельніцтва характарызуюцца невысокай нараджальнасцю (15—20 нованароджаных за год на 1 тыс. ж.), нізкай смяротнасцю (памірае 10—12 чал. за год на 1 тыс. ж.) і параўнальна невялікім натуральным прыростам. Краіны, дзе значная частка насельніцтва занята ў с. гасп. (сацыяліст. краіны Азіі, краіны, якія развіваюцца, калоніі), маюць высокі прырост насельніцтва, тлумачыцца гэта значнай нараджальнасцю (каля 40 нованароджаных за год на 1 тыс. ж.) пры невялікай смяротнасці (15—20 чал. за год на 1 тыс. жыхароў). У 1969 на З. нарадзілася каля 118 млн. чал., памерла каля 50 млн.; прырост насельніцтва каля 68 млн. чал. Больш як 57 млн. з іх прыпадае на краіны замежнай Азіі, Афрыкі і Лац. Амерыкі. Насельніцтва свету з пач. 16 ст. павялічылася ў 8 разоў, з 1920 да 1969 — амаль у два разы (гл. табл. 2).

Табліца 2

Рост насельніцтва Зямлі

Перыяд ацэнкі	Колькасць насельніцтва, млн. чал.
Пачатак неаліту (10—15 тыс. гадоў назад)	Некалькі млн. чалавек
Пачатак нашай эры	150 — 200
1000 н. э.	каля 300
1500	436
1800	911
1900	1617
1920	1811
1940	2252
1960	3010
2000 (ацэнкі ААН)	5965 — 6280

На З. насельніцтва размешчана нераўнамерна: ёсць неасвоеныя тэрыторыі (агульная пл. каля 10% сушы) і ёсць раёны з шчыльнасцю больш як 500—1000 чал. на 1 км². У найб. заселеных раёнах (5% сушы) жыве палова чалавецтва. Найб. шчыльна заселены некат. стараж. вобласці штучнага арашэння (даліна Ніла, далiны і дэльта Ганга і Брахмапутры, далiны Янцзы і Хуанхэ, в-аў Ява ў Інданезіі і інш.) і прамысл. раёны Еўропы, Паўн. Амерыкі, Японіі. Размяшчэнне насельніцтва вызначаецца і геаграфіяй гарадоў (гл. *Горад*). Паводле матэрыялаў перапісаў 1962—70 у гарадах жыве амаль палова людзей. Найб. сканцэнтраваны гарады ў індустрыяльных абласцях Зах. Еўропы, ЗША і Японіі. Высокі працэнт гар. насельніцтва ў урбанізаваных раёнах СССР (Падмаскоўе, Данбас, Кузбас). На размяшчэнне насельніцтва ўплываюць міграцыі — перасяленні людзей з адной краіны ці мясцовасці ў другую. Масавыя міграцыі адбываліся ў 19 — пач. 20 ст. пераважна з Еўропы, дзе капіталізм прыводзіў да збяднення сялян і рамеснікаў. У сярэдзіне 20 ст. вялікую ролю адыгрываюць унутр. міграцыі (напр., у СССР — з БССР і другіх раёнаў еўрап. часткі ў Казахстан, Сібір, на Д. Усход; у ЗША — з раёнаў эканам. дэпрэсіі на ўсходзе краіны ў раёны развіцця пераважна ваенпай прамысл. на захадзе краіны і інш.). Унутраныя міграцыі ў сацыяліст. краінах маюць планавы характар, а'яўляюцца стымулам развіцця новых прамысл. і с.-г. раёнаў.

Усё чалавецтва прынята падзяляць паводле характэрных асаблівасцей вонкавага аблічча людзей

Табліца 1

Асноўныя звесткі пра насельніцтва Зямлі (1969) *

	Колькасць насельніцтва, млн. чал.	Сярэдняя шчыльнасць, чал./км²	% гарадскога насельніцтва
Зямля	3552	26	каля 50
У т. л. СССР	240	11	56
замежная Азія	1988	72	25—30
замежная Еўропа	460	93	60—65
Амерыка	500	12	звыш 60
Афрыка	345	11	25—30
Аўстралія і Акіянія	18,9	2	звыш 75

* Усе звесткі ў табліцах 1—6 падлічаны па матэрыялах ААН.



Зямля. Здымак зроблены з космасу аўтаматычнай міжпланетнай станцыяй «Зонд-7» 8 жніўня 1969 г.





Іканапіс. 1. Пераскева Пятніца. Абраз. 16. ст. 2. Пётр Яўсеевіч з Галынічаў. Нараджэнне багародзіцы. Абраз. 1649. Абодва ў Дзярж. маст. музеі БССР.

на тры вялікія расы: еўрапеоідную (каля 47% насельніцтва З.), мангалоідную (каля 37%) і экватарыяльную (каля 5%). Каля 11% людзей адносіцца да мяшаных расавых тыпаў. Людзі групуюцца ў народы — гістарычна складзеныя на пэўнай тэрыторыі супольнасці людзей, якія маюць звычайна агульную мову, спецыфічныя рысы культуры і побыту і ўсведамляюць сваю прыналежнасць да гэтага народа (гл. *Народы Азіі*, *Народы Амерыкі*, *Народы Аўстраліі, Акіяніі і Філіпін*, *Народы Афрыкі*, *Народы Еўропы*). Ціпер у свеце прыкладна 2 тыс. народаў, каля 200 з іх налічвае больш як па 1 млн. чал. і складае каля 95% насельніцтва З. Найб. пашырана класіфікацыя народаў паводле іх моўнай прыналежнасці. У аснове такой класіфікацыі ляжыць паняцце моўнай сям'і. Кожная моўная сям'я аб'ядноўвае мовы, якія паходзяць ад мовы-асновы, што існавала раней. Вылучаюцца *інда-еўрапейскія мовы*, *іберыйска-каўказскія мовы*, *семіта-хамітскія мовы*, *банту мовы* і інш.

Насельніцтва капіталістычных краін складаецца з двух асноўных класаў: пралетарыяту і буржуазіі. Эксплуатацыя працоўных буржуазіяй спараджае ў кожнай буржуазнай краіне класавую барацьбу. У шматнацыянальных бурж. краінах да класавых супярэчнасцей далучаюцца і нацыянальныя, таму што буржуазія прыгнятае нац. меншасці. У краінах, дзе жывуць прадстаўнікі розных расаў, частка насельніцтва пакутуе ад расавай дыскрымінацыі. Усе гэтыя супярэчнасці характэрныя галоўнай краіне капіталізму — ЗША. Народы сацыяліст. краін складаюцца з класаў, інтарэсы якіх адзіныя. У шматнацыянальных сацыяліст. краінах усе народы карыстаюцца аднолькавымі правамі.

Важнай характарыстыкай насельніцтва з'яўляюцца занятасць і прафесійны склад. Працоўныя рэсурсы найбольш поўна выкарыстоўваюцца ў сацыяліст. краінах. Каля 80% працаздольнага насельніцтва занята ў нар. гаспадарцы. У капіталіст. краінах у сувязі з разрастаннем бюракратычнага і паліцэйскага апарату, непамерным пашырэннем рэкламнай справы і інш. памнажаецца колькасць працаздольных, занятых у галінах матэрыяльнай вытворчасці. Краінам сацыялізма характэрны поўная занятасць і рацыянальнае выкарыстанне працоўных рэсурсаў, пастаянны рост матэрыяльнага і культурнага ўзроўню насельніцтва. Вялікая частка насельніцтва капіталіст. свету і некат. групы людзей у сацыяліст. краінах вызнаюць рэлігію. Найболей пашыраны *хрысціянства* і *іслам*, менш — *будызм*, *індуізм*, канфуцыянства, сінтаізм, *іудаізм*, разнастайныя культы продкаў і анімізм.

Эканамічны агляд. З.— сфера актыўнай вытв. дзейнасці чалавека. З яе нетраў і акіяна ён здабывае неабходныя прадукты і сыравіну, на глебе, якая з'яўляецца асн. сродкам вытворчасці ў сельскай і лясной гасп., вырошчвае патрэбныя культуры, насадкі, гадуе жывёлу.

З развіццём прадукц. сіл дзейнасць чалавека распыраецца: ва ўрадлівыя землі ператвараюцца пустыні і балоты, павялічваецца здабыча карысных выкапняў, расце аб'ём прамысл. і с.-г. прадукцыі. Аснова сусв. эканомікі — энергетыка. Каля 90% энерг. рэсурсаў (без уліку ядз. паліва) — вугаль, каля 9 — гідраэнергія, каля 1,5% — нафта і газ. Амаль 40% энерг. рэсурсаў свету сканцэнтравана ў краінах сацыяліст. лагера. На аснове росту здабычы карысных выкапняў (гл. табл. 3), асабліва нафты, газу і вугалю, павялічваецца выпрацоўка эл. энергіі. Найбольш яе выпрацоўваюць (1968, млрд. *кВт · гадз*): ЗША (1435,5), СССР (638,7), Японія (270,6), Вялікабрытанія (223,3). У СССР на 1971—75 намечана ўвесці новыя магутнасці эл. станцый на 65—76 млн. *кВт*, пры гэтым 12% усяго прыросту магутнасцей дадуць атамныя эл. станцыі. Хутка развіваецца, асабліва ў сацыяліст. краінах, чорная металургія (вытворчасць сталі гл. ў табл. 4). У СССР выплаўка сталі ў 1975 павялічыцца да 142—150 млн. *т*. З галін каляровай металургіі найб. значэнне маюць: вытворчасць алюмінію (ЗША, СССР, Канада, Японія), медзі (ЗША, СССР, Замбія, Чылі), свінцу (ЗША, СССР, Канада, Аўстралія), цынку (ЗША, Японія, СССР, Канада), волава (Малайзія, Вялікабрытанія, Таіланд, Нігерыя), нікелю (Канада, Новая Каледонія, СССР, ЗША), вальфраму, малібдэну, сурмы і інш. Па агульным аб'ёме прадукцыі машынабудавання СССР займае 2-е месца ў свеце пасля ЗША, а па вытворчасці металарэзных станкоў, трактараў, збожжаўборачных камбайнаў, цеплавозаў, электравозаў — першае. Ва ўсім свеце вядомыя аўтамабілі і трактары бел. вытв-ву. Сярод інш. сацыяліст. краін развітым машы-

Табліца 3

Здабыча найважнейшых карысных выкапняў у краінах свету (млн. *т*)

	1953	1960	1968
Нафта			
Усе краіны свету	657,5	1051,9	1923,9
У тым ліку			
краіны сацыялізма	63,9	168,3	344,0
краіны, якія сталі на шлях незалежнага развіцця	256,9	495,4	1059,0
капіталістычныя краіны	336,7	388,2	520,9
Галоўныя вытворцы			
ЗША	318,5	348,0	449,9
СССР	52,8	147,9	328,0
Венесуэла	92,1	149,4	189,2
Саудаўская Аравія	41,5	62,1	141,0
Гаручы газ (млрд. $м^3$)			
Усе краіны свету		469,3	891,7
У тым ліку			
краіны сацыялізма		57,7	198,4
краіны, якія сталі на шлях незалежнага развіцця		24,4	48,5
капіталістычныя краіны		387,2	644,8
Галоўныя вытворцы			
ЗША		359,7	547,2
СССР		45,3	169,1
Канада		14,5	54,2
Румынія		10,1	21,7
Вугаль выкапнёвы			
Усе краіны свету	1948,0	2403,1	2750,7
У тым ліку			
краіны сацыялізма	752,9	1227,8	1481,6
краіны, якія сталі на шлях незалежнага развіцця	55,9	81,3	113,3
капіталістычныя краіны	1139,2	1094,0	1155,8
Галоўныя вытворцы			
СССР	313,4	490,1	594,0
ЗША	442,9	394,0	505,0
Кітай	72,1	229,0	304,0
ГДР	175,4	228,2	248,7
Жалезная руда			
Усе краіны свету	155,5	256,4	366,7
У тым ліку			
краіны сацыялізма	33,5	89,4	120,9
краіны, якія сталі на шлях незалежнага развіцця	17,1	51,6	96,5
капіталістычныя краіны	104,9	115,4	149,3
Галоўныя вытворцы			
СССР	31,3	54,1	92,0
ЗША	60,2	47,9	50,2
Канада	3,4	11,1	27,3
Кітай	*	30,2	20,9

* Няма звестак АЛН.

Центральная научная БИБЛИОТЕКА Академии наук Киргизской ССР
416812

Табліца 4

Вытворчасць сталі ў краінах свету (млн. *т*)

	1953	1960	1968
Усе краіны свету	235,0	347,2	532,1
У тым ліку			
краіны сацыялізма	53,2	107,0	160,7
краіны, якія сталі на шлях незалежнага развіцця	3,7	8,6	19,3
капіталістычныя краіны	178,1	231,6	352,1
Галоўныя вытворцы			
ЗША	101,2	90,1	119,3
СССР	38,1	65,3	106,5
Японія	7,7	22,1	66,9
ФРГ	18,1	34,1	41,2

набудаваннем вылучаецца ГДР (вытворчасць трансп. сродкаў, эл. машын і апаратаў), ЧССР (вытворчасць энерг., металург. і хім. абсталявання, станкоў, электравозаў, цеплавозаў), Польшча (лакаматыва- і вагонабудаванне, вытворчасць турбін, станкоў, с.-г. машын). Хім. прамысловасць найб. развіта ў сацыяліст. і гал. капіталіст. краінах: вытворчасць сернай кіслаты (ЗША, СССР, Японія), штучных угнаенняў (СССР, ЗША, краіны Паўн. Афрыкі, ГДР, ФРГ, Францыя), прамысловасць арган. сінтэзу і сінт. матэрыялаў (развітыя капіталіст. краіны, СССР). Тэкст. прамысловасць, акрамя сацыяліст. краін, пашырана ў краінах, якія сталі на шлях незалежнага развіцця (Індыя, Пакістан, АРЕ), а таксама ў капіталіст. краінах. СССР займае 1-е месца ў свеце па вытворчасці шарсцяных тканін і 2-е (пасля ЗША) па вытворчасці баваўняных. У развіцці с. гасп. найб. важнае значэнне мае земляробства, асабліва вытворчасць пшаніцы і рысу (гл. табл. 5). На долю апошніх разам з кукурузай прыпадае 70% усёй вытворчасці збожжавых. У вытворчасці мяса-малочных прадуктаў найважнейшае значэнне мае гадоўля буйной рагатай жывёлы і авечак (гл. табл. 6).

Табліца 5

Вытворчасць асноўных сельскагаспадарчых культур у краінах свету

	Сярэдні збор за 1952—56	1960	1968
1	2	3	4
Пшаніца (млн. *т*) *			
Усе краіны свету	207,8	243,6	331,6
У тым ліку			
краіны сацыялізма	83,5	103,3	145,0
краіны, якія сталі на шлях незалежнага развіцця	40,0	43,3	60,9
капіталістычныя краіны	84,3	97,0	125,7
Галоўныя вытворцы			
СССР	48,4	64,3	93,4
ЗША	29,4	36,9	42,7
Кітай	21,5	22,2	25,7*
Канада	15,0	14,1	17,7
Рыс (млн. *т*) **			
Усе краіны свету	200,8	234,6	285,9
У тым ліку			
краіны сацыялізма	79,6	83,9	100,8
краіны, якія сталі на шлях незалежнага развіцця	103,6	130,1	160,0
капіталістычныя краіны	17,6	20,6	25,1
Галоўныя вытворцы			
Кітай	76,4	80,0	95,2**
Індыя	39,9	51,9	59,6
Пакістан	12,8	16,1	20,1
Японія	13,5	16,7	18,8

Працяг

1	2	3	4
Бавоўна (тыс. *т*)			
Усе краіны свету	9196	10 055	11 223
У тым ліку			
краіны сацыялізма	2682	2877	3520
краіны, якія сталі на шлях незалежнага развіцця	3235	3925	5158
капіталістычныя краіны	3279	3253	2545
Галоўныя вытворцы			
ЗША	3193	3107	2383
СССР	1357	1485	2046
Кітай	1301	1366	1453
Індыя	835	1008	1084

* Па Албаніі, КНДР, МНР, Афганістане, Саудаўскай Аравіі, Йемене на 1968 узяты звесткі за 1967; па Кітаі — за 1966.

** Па Албаніі, КНДР, Кітаі на 1968 узяты звесткі за 1967.

Табліца 6

Пагалоўе асноўных відаў жывёлы (млн. галоў)

	Сярэдняя колькасць пагалоўя за 1951/52—1955/56	1967/68
Буйная рагатая жывёла		
Усе краіны свету	850,7	1088,1
У тым ліку		
краіны сацыялізма*	144,3	203,8
краіны, якія сталі на шлях незалежнага развіцця	491,1	632,7
капіталістычныя краіны	215,3	251,6
Краіны з найбольшым пагалоўем		
Індыя	158,7	176,1
ЗША	94,3	109,2
СССР	57,3	97,2
Бразілія	58,4	89,9
Авечкі		
Усе краіны свету	839,0	1057,2
У тым ліку		
краіны сацыялізма	183,7	254,3
краіны, якія сталі на шлях незалежнага развіцця	332,6	427,1
капіталістычныя краіны	322,7	375,8
Краіны з найбольшым пагалоўем		
Аўстралія	127,5	166,9
СССР	97,4	138,5
Кітай	46,2	70,0
Новая Зеландыя	37,8	60,5

* Звесткі па МНР адсутнічаюць.

Нягледзячы на дасягненні навук.-тэхн. прагрэсу і хуткае развіццё вытворчасці, вял. колькасць насельніцтва З. жыве ў беднасці і нястачы. Паводле ацэнак ААН 1,5 млрд. чал. пакутуюць ад непаўнацэннай (недахоп бялкоў, тлушчаў, вугляводаў або асобных вітамінаў) яды ці проста галадаюць. Бурж. эканамісты апраўдваюць гэта перанаселенасцю, змяншэннем урадлівасці глебы і замоўчваюць сапраўдныя прычыны: рабаванне калоній, анархію вытворчасці, мілітарызацыю эканомікі, агрэс. войны, узмацненне эксплуатацыі, эканам. крызісы і інш. фактары, што вызначаюць развіццё эканомікі краін капіталіст. свету. Як сцвярджаюць прагрэс. вучоныя, жыццёвых рэсурсаў на З. дастаткова, каб поўнасцю вырашыць харч. праблему з улікам павелічэння насельніцтва. Паводле звестак ААН, на З. апрацоўваецца толькі 11% пл. сухазем'я, у т. л. глебы стэпаў выкарыстоўваюцца на 36%, бурыя лясныя на 37, глебы саванаў на 4%. У многіх краінах вельмі нізкія ўраджаі. Поўнасцю выкарыстаць гэтыя рэзервы для развіцця эканомікі, паставіць іх на службу чалавецтву можна толькі шляхам сац. пераўтварэнняў. Толькі з устанаўленнем нар. улады краіны, якія раней былі эканам. адсталымі, за кароткі час выйшлі ў лік перадавых дзяржаў. Па тэмпах развіцця сацыяліст. краіны намнога апярэджваюць гал. капіталіст. краіны. Каб удвая павялічыць нац. даход, ЗША спатрэбілася 20 гадоў (уключаючы 1970), Вялікабрытаніі 30, ФРГ амаль 15, а СССР усяго 10. Калі ў 1950 доля сацыяліст. краін у сусв. прамысл. вытворчасці склала каля 20%, то ў 1969 каля 39%. Краіны сацыяліст. лагера планамерна, на аснове таварыскага супрацоўніцтва выкарыстоўваюць прыродныя і працоўныя рэсурсы, павышаюць эфектыўнасць вытворчасці дзеля інтарэсаў народа.

Літ.: Пути познания Земли, М., 1971; Батюшкова И. В. Внутреннее строение Земли, М., 1966; Горшков Г. П. Строение земного шара, М., 1958; Магницкий В. А. Внутреннее строение и физика Земли, М., 1965; Бончковский В. Ф. и Бублейников Ф. Д. Земля, ее фигура и физические свойства, М., 1956; Белоусов В. В. Земная кора и верхняя мантия материков, М., 1966; Гутенберг Б. Физика земных недр, пер. с англ., М., 1963; Жуков М. М., Славин В. И. и Дунаева Н. Н. Основы геологии, М., 1970; Леонов Г. П. Историческая геология, М., 1956; Калесник С. В. Общие географические закономерности Земли, М., 1970; Вилли К. Биология, пер. с англ., М., 1968; Жизнь животных, т. 1—5, М., 1968—70; У истоков человечества, М., 1964; Семенов Ю. И. Как возникло человечество, М., 1966; Рогинский Я. Я. Проблемы антропогенеза, М., 1969; Численность и расселение народов мира, М., 1962; Население земного шара, М., 1965; Население мира, М., 1965; Петрушов А. М. Человек и земля, М., 1970; Demographic Yearbook. 1969, New York, 1970; Statistical Yearbook. 1969, New York, 1970. *Г. П. Гаршкоў* (агульныя звесткі). Масква; *І. Д. Несцяровіч* (паходжанне), *Ж. П. Хацько* (унутраная будова і геалагічная гісторыя), *В. П. Якушка* (геаграфічныя асаблівасці), *С. С. Мельнікаў*, *В. В. Шчаглова* (жыццё, яго эвалюцыя і сучасныя формы), *І. І. Салівон* (асноўныя этапы развіцця чалавека і грамадства), *І. Я. Афнагель* (насельніцтва, эканамічны агляд). Мінск.

«ЗЯМЛЯ І ВОЛЯ» (60-х г. 19 ст.), рэвалюц. арганізацыя ў Расіі. Створана ў 1861 ва ўмовах рэвалюц. сітуацыі, каб да заканчэння тэрміну ўвядзення Палажэнняў 19.2.1861 падрыхтаваць усеагульнае сялянскае (ваенна-сялянскае) паўстанне ў 1863.

Стваральнікі і кіраўнікі «З. і в.»: М. Г. Чарнышэўскі, М. П. Агароў, А. І. Герцэн, М. А. і А. А. Серна-Салаўёвічы, М. М. Обручаў, А. А. Сляпцоў, М. І. Уцін і інш. «З. і в.» імкнулася аб'яднаць на аснове федэрацыі ўсе рэвалюц. арг-цыі Расіі. Абл. аддзяленні «З. і в.» існавалі ў Пецярбурзе, Маскве, Волагдзе, Ніжнім Ноўгарадзе, Казані, Саратаве, Астрахані, Пярмі, Цверы, Уладзіміры, Курску, Туле, Тамбове. У канцы 1862 у склад «З. і в.» ўвайшла ваенна-рэвалюц. арг-цыя *Камітэт рускіх афіцэраў у Польшчы*. Праграма «З. і в.» прадугледжвала ліквідаваць царскае самадзяржаўе шляхам усеагульнага ваенна-сялянскага паўстання, склікаць Народны сход (Земскі сабор), ператварыць Расію ў дэмакр. рэспубліку ў форме федэрацыі абласцей, перадаць усю зямлю і сродкі вытворчасці ва ўласнасць дзяржавы, даць кожнаму права на зямлю (ураўняльнае землекарыстанне) і ў выніку перайсці да сацыялізма праз сялянскую абшчыну. Рэвалюц.-дэмакр. змест праграмы «З. і в.» грунтаваўся на тэорыі утапічнага сялянскага сацыялізма, якую распрацавалі Герцэн, Агароў, Чарнышэўскі. Праграма «З. і в.» выкладалася і прапагандавалася ў газ. «Колокол», у пракламацыях, якія выдаваліся за мяжою і ў Расіі (2 нумары лістка «Свобода», № 1 час. «Земля и воля»).

«З. і в.» рашуча падтрымала *паўстанне 1863—64* у Польшчы, на Беларусі і ў Літве і дамагалася расшырыць яго сац. базу на аснове радыкальнага вырашэння агр. пытання, імкнулася ператварыць яго з лакальнага нацыянальнага ва ўсерасійскае сялянскае паўстанне за зямлю і волю. Многія члены ваенна-рэвалюц. арг-цыі «З. і в.» ўдзельнічалі ў баях супраць царскіх войск. Разгром паўстання 1863 узмацніў рэакцыю і аслабіў рэвалюц.-дэмакр. сілы. У пач. 1864 «З. і в.» перастала існаваць.

Літ.: Ленін У. І. Памяці Герцэна, Тв., т. 18 (Полн. собр. соч., т. 21); Нечкина М. В. Возникновение первой «Земли и воли», у кн.: Революционная ситуация в России в 1859—1861 гг., М., 1960; Віткоўскі І. А. «Зямля і воля» 60-х гадоў і сувязь яе з паўстаннем 1863 г., «Полымя», 1930, кн. 4.

М. В. Біч. Мінск.

«ЗЯМЛЯ І ВОЛЯ» (70-х г. 19 ст.), арганізацыя рэвалюцыянераў-разначынцаў (народнікаў) у Расіі. Узнікла ў 1876.

Стваральнікі і кіраўнікі «З. і в.»: М. А. і В. А. Натансоны, А. Дз. Міхайлаў, Г. В. Пляханаў, А. Дз. Абалешаў, В. А. Асінскі, Дз. А. Лізагуб, А. А. Квяткоўскі, В. В. Аптэкман, А. І. Зундзялевіч і інш. Гурткі і групы «З. і в.» існавалі ў Пецярбурзе, Маскве, Кіеве, Адэсе, Харкаве, Саратаўскай, Тамбоўскай, Самарскай, Варонежскай, Ніжагародскай, Казанскай, Астраханскай, Пскоўскай губ., на Паўн. Каўказе, Урале. Праграма «З. і в.» грунтавалася на утапічнай тэорыі сялянскага сацыялізма і прадугледжвала пераход зямлі сялянам (з раўнамерным яе падзелам), перадачу грамадскіх функцый абшчынам, падзел Расійскай імперыі на часткі «адпаведна мясцовым жаданням». Землявольцы імкнуліся стварыць моцную, дысцыплінаваную, баяздольную, цэнтралізаваную арг-цыю рэвалюцыянераў, якая павінна была падрыхтаваць узбр. народнае паўстанне («бунт»). У паліт. поглядах яны былі анархісты, падтрымлівалі т. зв. федэралісцкі інтэрнацыянал, створаны М. А. Бакуніным. Рабочым у праграме «З. і в.» адводзілася роля рэзерву сялянскай рэвалюцыі. Пецярбургская арг-цыя землявольцаў у 1878—79 падтрымлівала рабочыя стачкі, спрабавала весці рэвалюц. агітацыю на аснове эканам. інтарэсаў рабочых. Землявольцы выдавалі час. «Земля и воля», «Листок «Земли и воли» і інш. тыражом да 3 тыс. экз. Дзейнасць «З. і в.» аб'ектыўна мела антыўрадавы характар, аднак да паліт. барацьбы землявольцы ставіліся адмоўна, бо не хацелі ўвядзення бурж.-дэмакр. свабод і развіцця Расіі па капіталіст. шляху. Пераканаўшыся ў неэфектыўнасці «хаджэння ў народ», у немагчымасці ўзняць паўстанне без працяглай агітацыі і грунтоўных сувязей з сялянствам, землявольцы замацоўваліся ў вёсках на пасадах фельчараў, настаўнікаў, пісараў, рамеснікаў і інш. Адсутнасць прыкметных вынікаў дзейнасці сярод сялян, узмацненне рэпрэсій прымусілі частку землявольцаў у канцы 1878 — пач. 1879 прызнаць неабходнасць заваявання паліт. правоў. Індывідуальны тэрор, які праграма «З. і в.» дапускала раней як сродак самаабароны і помсты, быў аб'яўлены важным сродкам паліт. барацьбы. Пратэсты прыхільнікаў старой апалітычнай праграмы «З. і в.» прымусілі ў чэрв. 1879 склікаць з'езд землявольцаў (Варонеж). Аднак аднавіць адзінства «З. і в.» не ўдалося, і ў жн. 1879 яна распалася на *«Чорны перадзел»* і *«Народную волю»*.

На Беларусі ў 1876—79 народніцкія гурткі існавалі пераважна сярод вучнёўскай моладзі — у Мінску, Магілёве, Гродне, Горках. Праз землякоў-студэнтаў з Пецярбурга, Масквы, Харкава, Кіева і інш. гарадоў яны былі звязаны з «З. і в.», атрымлівалі, чыталі і абмяркоўвалі народніцкую л-ру. Дзейнасць народнікаў і іх арг-цый разгарнулася на Беларусі ў перыяд «Народнай волі» і «Чорнага перадзелу». Гл. таксама *Народніцтва*.

Літ.: Ленін У. І. Што рабіць?, Тв., т. 5 (Полн. собр. соч., т. 6); яго ж. Крок уперад, два крокі назад, Тв., т. 7 (Полн. собр. соч., т. 8); Ткаченко П. С. Революционная народническая организация «Земля и воля» (1876—1879 гг.), М., 1961.

М. В. Біч. Мінск.

ЗЯМЛЯНКА, заглыбленая ў зямлю жылая пабудова з адна- або двухсхільным дахам з жэрдак ці бярвення, засыпаных зямлёю.

Сцены робяць з бярвення ці плятуць з галля і абмазваюць глінаю. З. паявіліся ў эпоху верхняга палеаліту (стаянкі Ціманаўка Бранскай вобл., Бурэць у Сібіры і інш.). У эпоху неаліту З. былі невялікіх памераў з агнішчам у цэнтры, у эпоху бронзы — вялікія з некалькімі памяшканнямі і агнішчамі. Як жыллё З. і паўзямлянкі ў заран, удмуртаў зберагліся да 17—18 ст., у чукчаў, айнаў, ніўхаў да 19 ст., у каракаў, селькупаў, кетаў да 20 ст., у паўн.-амер. індзейцаў і эскімосаў да нашых дзён.

На Беларусі ў палеаліце і неаліце, жалезным веку, раннім сярэдневякоўі (6—9 ст.) і ў эпоху Кіеўскай Русі вядомыя паўзямлянкі (гл. ў арт. *Жыллё*). У Вял. Айч. вайну З. карысталіся партызаны і насельніцтва вёсак, спаленых ням.-фаш. захопнікамі.

ЗЯМЛЯ́ЧКА, Самойлава (сапр. Залкінд) Разалія Самойлаўна (1.4.1876, Кіеў — 21.1.1947), прафесійная рэвалюцыянерка, савецкі парт. і дзярж. дзеяч. Чл. КПСС з 1896. У рэвалюц. руху з 1893. Агент «Искры», чл. ЦК РСДРП (1903) і Бюро к-таў большасці (1904), сакратар МК РСДРП (1905), Бакінскай парт. арг-цыі (1909). Няраз арыштоўвалася. У 1915—16 чл. Маскоўскага бюро ЦК РСДРП, у 1917 1-ы сакратар МК РСДРП(б), удзельніца Кастр. рэвалюцыі ў Маскве. У грамадз. вайну нач. палітаддзелаў 8-й і 13-й армій. З 1920 да 1926 на парт. рабоце ў Крыме, Маскве, Растове-на-Доне, на Урале. У 1924—34 чл. ЦКК ВКП(б), з 1934 член, нам. старшыні і старшыня Камісіі сав. кантролю. З 1939 да 1943 нам. Старшыні СНК СССР, потым нам. старшыні Камісіі парт. кантролю пры ЦК ВКП(б). На XVIII з'ездзе ВКП(б) (1939) выбрана чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета СССР 1-га скл. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, ордэнам Чырв. Сцяга. Аўтар успамінаў пра У. І. Леніна.

ЗЯМНА́Я КАРА́, вонкавая цвёрдая абалонка *Зямлі*. Ніжняя мяжа З. к., якая аддзяляе яе ад мантыі, называецца *Махаровічыча паверхняй*.

У саставе З. к. вылучаюць тры слаі: верхні — асадкавы, складзены пераважна з асадкавых горных парод, якія ўтварыліся і намножыліся на зямной паверхні за сотні мільёнаў гадоў (ніжняя ч. гэтага слоя складзена з метамарфічных парод); сярэдні — т. зв. гранітны, складзены з кіслых магматычных горных парод тыпу гранітаў; ніжні — базальтавы, складзены з асн. магматычных горных парод тыпу базальтаў. Асадкавы, гранітны і базальтавы слаі разам утвараюць абалонку сіяль (ад назваў элементаў Si і Al, найб. пашыраных у гэтых слаях). Непасрэднаму вывучэнню даступна толькі верхняя частка З. к. (15—20 *км*). Больш глыбокія часткі даследуюць геафізічнымі метадамі. Вылучаюць тры галоўныя тыпы З. к.: платформавы, сучасных складкавых зонаў і акіянічны. Магутнасць З. к. на платформавых раўнінных раёнах (Усх.-Еўрап., Зах.-Сіб. платформы) да 40—50 *км*, з якіх 25—30 *км* складае базальтавы слой, 10—15 *км* — гранітны і мала — асадкавы. На Беларусі магутнасць З. к. 36—42 *км*, павялічваецца на У. У сучасных складкавых зонах (напр., у Альпах) магутнасць асадкавага слоя расце да многіх кіламетраў; тут асадкавыя пароды вельмі перамятыя і пранізаныя целамі вывергнутых парод; магутнасці гранітнага слоя павялічаны. Пад горнымі масівамі ўзнікае т. зв. сіялічны корань — патаўшчэнне, уціснутае ў мантыю на 40—70 *км*. На дне акіянаў (напр., Ціхага) асадкавых адкладаў мала, гранітнага слоя часта няма, а базальтавы слой вельмі тонкі (5—10 *км*).

Літ.: Борисов А. А. Глубинная структура территории СССР по геофизическим данным, М., 1967; Деменицкая Р. М. Кора и мантия Земли, М., 1967; Проблемы современных движений земной коры, М., 1969; Хотько Ж. П. Глубинная структура земной коры территории БССР по геофизическим данным, «Доклады АН БССР», 1966, т. 10, № 3.

Г. П. Гаршкоў. Масква.

ЗЯМНЫ́ МАГНЕТЫ́ЗМ (геамагнетызм), уласцівасць Зямлі, што абумоўлівае існаванне вакол яе *магнітнага поля*. У кожным пункце прасторы магн. поле Зямлі характарызуецца вектарам напружанасці магн. поля T ці яго кампанентамі. Паўночная (X), усходняя (Y), вертыкальная (Z), гарызантальная (H) кампаненты гэтага вектара, а таксама *схіленне магнітнае* (вугал D) і *нахіленне магнітнае* (вугал I) наз. элементамі З. м. Звычайна яны вызначаюцца ў прамавугольнай сістэме каардынат з пачаткам у пункце вымярэння і кірункам восі x па геагр. мерыдыяне, восі y — на ўсход і восі z — вертыкальна ўніз (гл. рыс.). Элементы З. м. звязаны суадносінамі:



$$X = H\cos D; \quad Y = H\sin D; \quad Z = H\,\mathrm{tg}\,I;$$
$$H = \sqrt{X^2 + Y^2}; \quad T = H\sec I = \sqrt{H^2 + Z^2}.$$

Гэта дае магчымасць вымяраць некаторыя з іх (звычайна H, D, I) і вылічваць іншыя.

Магн. поле Зямлі складаецца з пастаяннага і пераменнага. Пастаяннае поле абумоўлена ўнутр. будовай Зямлі і звязана з дзеяннем *віхравых токаў* у зямным ядры. Яно рознае ў розных пунктах зямной паверхні і павольна зменьваецца (векавыя ваганні). Магн. поле Зямлі мае магн. полюсы, якія не супадаюць з геаграфічнымі, іх становішча зменьваецца ў часе. Для вывучэння пастаяннага поля і яго прасторавага размеркавання складаюць карты элементаў З. м.: карты схіленняў (ізагон), нахіленняў (ізаклін), гарызантальнай кампаненты (ізадынам) і інш. Значная змена элементаў З. м. выклікае неабходнасць перыядычна ўдакладняць магн. карты. Адхіленні напружанасці і характару размеркавання элементаў З. м. ад сярэдняга (т. зв. нармальнага) поля для зададзенай вобласці наз. магнітнымі анамаліямі. Адрозніваюць мацерыковыя (звязаныя з крыніцамі глыбінных зон Зямлі), рэгіянальныя і лакальныя анамаліі. Рэгіянальныя і лакальныя вызначаюцца нераўнамерным размеркаваннем у зямной кары парод, багатых на ферамагнітныя элементы (гл. *Магнетызм горных парод і мінералаў*), і звязаны з геал. будовай і тэктанічнай структурай тэрыторыі, што з'яўляецца асновай для *магнітаметрычных метадаў разведкі*. Пераменнае поле выклікаецца эл. токамі ў верхніх слаях атмасферы — у іанасферы. Яно падзяляецца на перыядычныя і аперыядычныя варыяцыі. Перыядычныя варыяцыі звязаны са становішчам Зямлі адносна Сонца і заканамерна выяўляюцца на працягу сутак, года, цыкла *сонечнай актыўнасці*. Аперыядычныя варыяцыі — *магнітныя буры* і інш. выклікаюцца набліжэннем да Зямлі патокаў зараджаных часцінак, якія выкідваюцца актыўнымі абласцямі Сонца. Геамагнітныя даследаванні праводзяцца з дапамогай *магнітометраў* магн. станцыямі, абсерваторыямі, немагнітнымі суднамі, дрэйфуючымі станцыямі, самалётамі, штучнымі спадарожнікамі. На Беларусі магн. даследаванні вядуць Геафізічная абсерваторыя Ін-та геахіміі і геафізікі АН БССР (гл. *Геафізічная абсерваторыя*) і геафізічныя экспедыцыі Упраўлення геалогіі пры СМ БССР. Вынікамі вывучэння геамагн. поля шырока карыстаюцца пры марской і паветранай навігацыі, пошуках і разведцы радовішчаў карысных выкапняў, у радыёвяшчанні, пры вывучэнні праблем фізікі Сонца і сонечна-зямных сувязей.

Літ.: Яновский Б. М. Магнитное поле Земли, Л., 1967; Логачев А. А. Курс магниторазведки, 2 изд., Л., 1962; Гаусс К. Ф. Избр. тр. по земному магнетизму, пер. с нем., Л., 1952.

ЗЯМНЫ́Я ПРЫЛІВЫ, дэфармацыя цвёрдай, а таксама вадкай (гл. *Прылівы і адлівы*) абалонак Зямлі ад прыцяжэння Месяца і Сонца. Сіла прыліваў залежыць ад узаемнага размяшчэння гэтых нябесных целаў.

ЗЯМСКО́Ў Анатоль Васілевіч [н. 18.6(1.7). 1906, в. Пясочнева Шуйскага пав. Уладзімірскай губ.], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Мінскай вобл. ў Айч. вайну. З рабочых. Чл. КПСС з 1932. Скончыў Цэнтр. школу НКУС (1936). З 1940 нач. аддзела НКУС БССР. У партызанах з 24.9.1943 — нам. камандзіра партыз. брыгады; з 18.11.1943 камісар *партызанскай брыгады «Разгром»* Мінскай вобл., з лютага 1944 нам. камандзіра брыгады. Узнаг. ордэнам Чырв. Сцяга, медалямі.

ЗЯМЯ́НЕ, група ваенна-служылага насельніцтва Беларусі ў 16—18 ст. Жылі ў каралеўскіх і магнацкіх маёнтках, мелі ўчасткі зямлі і былі васаламі караля ці магната.

У 16 — 1-й пал. 17 ст. З. называлі звычайна шляхту. У некат. магнацкіх латыфундыях (Нясвіж, Слуцк, Мір, Клецк, Быхаў і інш.) у 18 ст. З. называлі дробную шляхту, частка якой да пачатку 19 ст. збяднела і не адрознівалася ад сялян. У 18 ст. магнаты, каб павялічыць свае ўзбр. сілы, пераводзілі ў разрад З. некаторых сялян. Такія З. разам з *баярамі* — вярхі сялянства. З. ў 18 ст. называліся і патомкі ваенна-служылых людзей, якія не мелі шляхецкіх правоў,— баяр путных, панцырных. Часта на іх ускладаліся паліцэйскія функцыі ў маёнтках. У 1-й пал. 19 ст. значная частка З. змагла даказаць сваё дваранства, астатнія былі пераведзены ў групу «вольных людзей» (дзярж. сялян): З.— шляхта, якая не змагла пацвердзіць сваёй прыналежнасці да дваранскага саслоўя, і зямяне сялянскага паходжання.

Літ.: Похилевич Д. Л. Крестьяне-слуги в Великом княжестве Литовском в XVII—XVIII веках, у зб.: Средние века, в. 21, М., 1962; Грицкевич А. П. Хозяйственное и правовое положение военно-служилого населения в Слуцком княжестве в XVI—XVIII вв., у кн.: Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы. 1962 г., Мн., 1964.

А. П. Грыцкевіч. Мінск.

ЗЯНКО́ВІЧ Фелікс Паўлавіч [1843, маёнтак Макраны Пружанскага пав. Гродзенскай губ.— 25.3(7.4).1910], удзельнік паўстання 1863 на Беларусі і ў Літве. З дваран. Вучыўся ў Пружанах, Беластоку і ў Пецярбургскім ун-це, удзельнічаў у студэнцкім руху. З жн. 1862 за мяжою, зблізіўся з А. І. Герцэнам і М. П. Агаровым. Удзельнік марской экспедыцыі паўстанцаў з Англіі ў Літву. З ліп. 1863 у Вільні, памочнік К. Каліноўскага, сакратар *Выканаўчага аддзела Літвы*. 7.8. 1863 арыштаваны і прыгавораны да расстрэлу, замененага 12-гадовай катаргай у сібірскіх рудніках. З 80-х г. на радзіме.

Літ.: Кісялёў Г. Па слядах аднаго пісьма М. П. Агарова і А. І. Герцэна, у яго кн.: З думай пра Беларусь, Мн., 1966.

ЗЯНКО́ЎКА, металарэзны інструмент, якім робяць канічныя паглыбленні ці здымаюць фаскі з тарцовай часткі папярэдне апрацаванай адтуліны (гл. рыс.). Аперацыя апрацоўкі зянкоўкай называецца зенкаваннем.



Літ.: Гл. пры артыкуле *Металарэзны інструмент*.

ЗЯНО́ВЕЦ, ракітнік (Cytisus), род кустоў сям. матыльковых. Вядома каля 150 відаў, пашыраных у Еўропе, Зах. Азіі і Паўн. Афрыцы. У СССР 18 відаў, на Беларусі тры.

Выш. З. да 2 *м*. Лісце трайчастае, рэдка цэласнае. Кветкі жоўтыя, чырвоныя ці белыя, сабраныя ў гронкі. Плод — струк. На Беларусі найб. вядомы — З. рускі (C. ruthenicus), ядавітая расліна (змяшчае алкалоід цыцізін), расце ў сухіх хваёвых лясах. Як дэкар. вырошчваюць зяновец Ліндэмана, З. падоўжаны, З. аўстрыйскі, З. галоўчаты. Усе віды З. добрыя меданосы.



Зяновец рускі: *1* — галінка з лісцем і кветкамі; *2* — кветка; *3* — галінка з пладамі.

Літ.: Флора БССР, т. 3, Мн., 1950.

ЗЯНО́Н Элейскі (Zénōn Heleátēs; н. каля 490, Элея ў Паўд. Італіі — 430 да н. э.), старажытнагрэчаскі філосаф, прадстаўнік элейскай школы. Упершыню ўвёў дыялагічную форму доказу. Лічыў, што быццё адзінае, нерухомае і пазнаецца толькі розумам, а разнастайнасць (мноства) і рух — толькі дапушчэнні пачуццёвага ўспрымання і не могуць быць лагічна даказаны. Гэтае сцвярджэнне З. сфармуляваў у выглядзе парадоксаў (гл. *Апарыя*), у якіх у адмоўнай форме паставіў пытанне пра дыялект. прыроду руху.

Літ.: Ленін У. І. Філасофскія сшыткі, Тв., т. 38, с. 244—250 (Полн. собр. соч., т. 29, с. 228—234).

ЗЯНЬКЕ́ВІЧ Рамуальд Сымонавіч (1.2.1811, Свянцянскі пав. Віленскай губ.— 11.9.1868), даследчык беларускага фальклору і этнаграфіі, педагог. Скончыў філал. ф-т Віленскага ун-та (1830). Настаўнік і выхавальнік у прыватных дамах, у доме князёў Друцкіх-Любецкіх на Піншчыне. Цікавіўся археалогіяй (арт. «Пра курганы і гарадзішчы Ашмянскага павета», 1848), збіраў бел. нар. песні («Народныя песні, сабраныя на Піншчыне і перакладзеныя Р. Зянькевічам», «Athenaeum», 1847, т. 4, сш. 4). У зб. «Народныя песенькі пінскага люду» (Коўна, 1851, перадрук. ў 52-м т. «Поўнага збору прац» О. Кольберга, 1968) змясціў 219 бел. нар. песень, запісаных над Пінаю, Прыпяццю і Цною, даў апісанне мясцовых абрадаў (вясельных, калядных, купальскіх, жніўных і інш.). Аўтар

даследавання «Пра ўрочышчы і звычаі пінскага люду, а таксама пра характар яго песні» («Biblioteka Warszawska», 1852, т. 4, 1853, т. 1). Пісаў вершы (зб. «Рыфмаваныя спробы», Вільня, 1856), даследаваў польскую л-ру, паасобныя праблемы педагогікі (працы «Гісторыя польскай літаратуры», «Пра выхаванне моладзі, з выказам абавязкаў бацькоў і настаўнікаў», «Сістэматычны агляд усіх навук» асталіся ў рукапісах).

Літ.: Саламевіч І. У. Рамуальд Сымонавіч Зянькевіч, «Полымя», 1968, № 9; Korotyńska W. Romuald Zienkiewicz, «Tygodnik illustrowany», 1869, t. 4, № 103 (пад крыпт. W. K.).

І. У. Саламевіч. Мінск.

ЗЯНЬКО́ВА Ефрасіння Савельеўна (н. 22.12.1923, в. Ушалы Віцебскага пав.), Герой Сав. Саюза (1958). З сялян. Чл. КПСС з 1945. Працавала на віцебскай фабрыцы «Сцяг індустрыялізацыі». У чэрв. 1941 вярнулася ў родную вёску, наладзіла сувязь з партыз. атрадам імя Варашылава брыгады імя Леніна, выконвала яго заданні, вяла разведку. У 1942 узначаліла *Обальскае камсамольскае падполле* на ст. Обаль Віцебскай вобл. Толькі на станцыі члены арг-цыі зрабілі 21 дыверсію: узарвалі вадакачку, машыннае аддз. цагельнага з-да, 3 матавозы, экскаватар, эшалон з палівам і снарадамі, спалілі льнозавод і інш. У 1942—44 партызанка брыгады імя Леніна. Жыве і працуе ў Віцебску.



Літ.: Николаев В. и Щербаков А. Когда смерть не страшна, М., 1958; Люди легенд, в. 1, М., 1965, с. 463—473.

ЗЯНЬКО́ВІЧ Андрэй Георгіевіч (1883, в. Паршчэўшчына Сенненскага пав. Магілёўскай губ.— 2.8.1918), удзельнік барацьбы за Сав. ўладу на поўначы Расіі. З сялян. Чл. КПСС з 1917. Удзельнік рус.-яп. і 1-й сусв. войнаў. З 1916 у Растове-Яраслаўскім, дзе пасля Лют. рэвалюцыі член, а потым старшыня Савета. З 1.6.1918 ваен. камісар Архангельскай губ., удзельнічаў у стварэнні атрадаў Чырв. Арміі і ўмацаванні абароны Архангельска супраць інтэрвентаў і белагвардзейцаў, чл. Савета абароны горада. Забіты белагвардзейцамі. На ст. Ісакагорка над Архангельскам пастаўлены помнік З.

Літ.: Борьба за торжество Советской власти на Севере. Сб. документов (1918—1920), Архангельск, 1967; Незабываемые имена, Архангельск, 1967, с. 111—118.

Я. Ф. Шорахай. Мінск.

ЗЯРНО́Ў Сяргей Аляксеевіч [29.5(10.6).1871, Масква — 28.2.1945], савецкі вучоны ў галіне гідрабіялогіі, адзін з заснавальнікаў гідрабіялогіі ў Расіі. Акад. АН СССР (1931). Чл. КПСС з 1930. Скончыў Маскоўскі ун-т (1895). У 1897—98 за рэвалюц. дзейнасць быў у ссылцы. У 1914—30 праф. Маскоўскага с.-г. ін-та (з 1917 Пятроўская акад., з 1923 Маскоўская с.-г. акадэмія імя Ціміразева), дзе стварыў першую кафедру гідрабіялогіі ў Расіі. У 1931—42 дырэктар Заалаг. ін-та АН СССР. Асн. працы па экалогіі, біяцэналогіі, планктаналогіі. Апісаў фаўну і біяцэнозы Чорнага м. (1913), заканамернасці іх размеркавання; адкрыў у паўд.-зах. частцы мора чырв. водарасці — філафоры (гэта дало магчымасць наладзіць здабычу ёду). Узнаг. ордэнам Леніна.



Тв.: Общая гидробиология, 2 изд., М.— Л., 1949.

Літ.: Павловский Е. Н. и Берг Л. С. Академик Сергей Алексеевич Зернов, у кн.: Памяти академика Сергея Алексеевича Зернова, М.— Л., 1948.

ЗЯЦЬ, у адносінах да бацькоў муж дачкі. Гл. *Родныя і сваяцтва.*

І

І, дзесятая літара беларускага алфавіта. Бярэ пачатак з кірыліцкай І («і дзесятырычнага»), утворанай на аснове візант. «ёты» (І). У старабел. графіцы мела варыянты І, і, часцей ї. У сучаснай бел. мове абазначае нелабіялізаваны галосны «і» пярэдняга раду верхняга пад'ёму («кніга», «маліна»), а таксама спалучэнне гукаў «йі» («салаўйіны», «крайіна»).

ІАА́Н (Іван), старажытнарускі дойлід 12 ст. Пабудаваў паміж 1128 і 1156 *Спаса-Ефрасіннеўскую царкву* ў Полацку. Удзельнічаў у стварэнні комплексу манастыра ў *Бельчыцах*: пабудаваў Барысаглебскую царкву і, магчыма, цэрквы Пятніцкую і Узнясенскую.

ІАА́Н XXIII (Ioannes), свецкае імя Анджэла Джузепе Ранкалі (25.11.1881—3.6.1963), папа рымскі (з 1958). На ватыканскай службе з 1921. Прадстаўнік Ватыкана ў Балгарыі (1925—35), Турцыі і Грэцыі (1935—44), у Францыі (1944—53). У 1953—58 патрыярх Венецыі. Кардынал з 1953. Пры І. XXIII пачалася змена курсу каталіцкай царквы, прыстасаванне каталіцызму да сац.-паліт. змен, якія адбыліся ў свеце. І. XXIII выступіў за мір і мірнае суіснаванне дзяржаў з рознымі сац. ладам, за супрацоўніцтва веруючых і неверуючых дзеля захавання міру. У 1962 склікаў 2-і Ватыканскі сабор каталіцкай царквы (гл. *Ватыканскія саборы*), каб вызначыць шляхі захавання ўплыву каталіцызму на масы.

Літ.: Шейнман М. М. От Пия IX до Иоанна XXIII, М., 1966; Markiewicz S. Jan XXIII wobec problemów współczesności, Warszawa, 1962; яго ж. Polityka Jana XXIII i Pawła VI, Warszawa, 1964.

ІААНІСЯ́Н Іаанес [26.4(8.5).1864, с. Вагаршапат — 29.9.1929], армянскі паэт-дэмакрат. З сялян. Скончыў Маск. ун-т (1888). У 1888—1912 настаўнік. З 1912 у Баку, у дні Бакінскай камуны кіраваў гар. аддзелам асветы. З 1922 у Заканадаўчай камісіі пры СНК Арм. ССР, у ін-це па складанні слоўнікаў і выпрацоўцы тэрміналогіі. Вітаў Кастр. рэвалюцыю. Друкавацца пачаў у 80-я г. Раннія вершы — узоры арм. грамадз. лірыкі. Пісаў эпічныя творы з гістар. мінулага («Князь Сюнійскі»), вершы на абарону заняволенага сялянства («Зерне», «Сельскі храм»), апрацоўваў міфалаг. сюжэты і нар. легенды («Нараджэнне Ваагна», «Цар Артавазд»). Майстар любоўнай лірыкі і пясняр прыроды Арменіі. Шырока апіраўся на фальклор. Большасць яго лірычных вершаў сталі нар. песнямі.

Тв.: Рус. пер.— Избранное, М., 1949; Лирика, М., 1963.

Літ.: Хитарова С. Поэзия Иоаннисяна, М., 1968.

ІАГА́НЕСБУРГ (Johannesburg), найбольшы горад Паўд.-Афр. Рэспублікі, у прав. Трансвааль, на горным кражы Вітватэрсранд. Мае многа гарадоў-спадарожнікаў. Засн. ў 1886 як гарняцкі пасёлак. Вузел чыг. і аўтамаб. дарог, два аэрапорты (у т. л. міжнародны). 1601 тыс. ж. (з прыгарадамі, 1967), з іх палова афрыканцы. Цэнтр найбольшага ў капіталіст. свеце золатапрамысл. раёна. У І. знаходзяцца праўленні асн. банкаў і прамысл. кампаній ПАР. Металаапр., машынабуд., хім., харч., папярова-цэлюлозная, гарбарная прамысловасць. Агранаванне алмазаў. Ун-т (з 1922), абсерваторыя, музей.

ІАГАНСО́Н Барыс Уладзіміравіч [н. 13(25).7.1893, Масква], рускі савецкі жывапісец. Герой Сац. Працы (1968). Нар. мастак СССР (1943). Правадз. чл. (з 1947), прэзідэнт (1958—63) АМ СССР. Чл. КПСС з 1943. Вучыўся ў Маск. вучылішчы жывапісу, ваяння і дойлідства (1912—18) у К. Каровіна. Чл. АМРР з 1922. У першых творах «Савецкі суд», «Рабфак ідзе», «Вузлавая чыг. станцыя ў 1919 годзе» (усе 1928) раскрыў новыя з'явы ў жыцці маладой сав. дзяржавы. Карціны «Допыт камуністаў» (1933) і «На старым уральскім заводзе» (1937) — адны з лепшых твораў гісторыка-рэвалюц. жанру ў сав. жывапісе таго часу. Група мастакоў пад кіраўніцтвам і з удзелам І. стварыла ў 1950 вял. шматфігурнае палатно «Выступление



У. І. Леніна на III з'ездзе камсамола». Вобразы правадыра і камсамольцаў прасякнуты палымянай верай у перамогу ідэй камунізма. Аўтар партрэтаў (артысткі Д. Зяркалавай, 1947; У. Неміровіча-Данчанкі, 1948), пейзажаў, нацюрмортаў. Дзяржаўныя прэміі СССР 1941 і 1951. Узнагароджаны ордэнам Леніна, ордэнам «Знак Пашаны». Іл. гл. на ўклейцы I да арт. *Гістарычны жанр.*

Літ.: Сокольников М. П. Борис Владимирович Иогансон, М., 1957.

ІАКАГА́МА, горад у Японіі на в-ве Хонсю, на зах. узбярэжжы Такійскага заліва. Адм. ц. прэфектуры Канагава. Засн. ў 1858 на месцы двух рыбацкіх пасёлкаў. Буйны гандл.-пасаж. порт і важны індустр. цэнтр. Злучаны з Токіо суднаходным каналам даўж. 22,6 *км*. Вузел чыг. і аўтамаб. дарог. 2237 тыс. ж. (1970). Судна- і машынабудаўнічая, металург., ваен. (самалётабудаванне), хім. (у т. л. нафтаперапрацоўчая), эл.-тэхн., тэкст., фарфора-фаянсавая, харч. прамысловасць. 1.9.1923 І. моцна разбурана землетрасеннем.

ІАНАСФЕ́РА (ад *іоны*+грач. sphâira сфера, шар), верхняя частка *атмасферы*, дзе знаходзіцца значная колькасць свабодных часцінак — электронаў і іонаў. Ніжняя мяжа І. на выш. 50—60 *км* (удзень) і 80—85 *км* (уначы), а верхняя распасціраецца да выш. 18—25 тыс. *км*. І. паступова пераходзіць у міжпланетную плазму.

Крыніцы іанізацыі высокіх слаёў атмасферы — ультрафіялетавае і рэнтгенаўскае выпрамяненне Сонца і патокі часцінак, што ўрываюцца ў атмасферу з калязямной касм. прасторы. Асн. характарыстыка І.— электронная канцэнтрацыя, якая залежыць ад вышыні над Зямлёю, геагр. шыраты і даўгаты, ад цыкла *сонечнай актыўнасці* і зменьваецца на працягу сутак, года. Істотна ўплывае на І. магн. поле Зямлі і яго ўзбурэнні (гл. *Зямны магнетызм*). Даследуюць І. радыёметадамі, а ў апошні час з дапамогай ракет і штучных спадарожнікаў Зямлі. Вывучэнне І. мае вял. значэнне для радыёсувязі (на кароткіх і сярэдніх хвалях).

Літ.: Данилов А. Д. Химия ионосферы, Л., 1967; Хвостиков И. А. Физика озоносферы и ионосферы, М., 1963; Ионосферные исследования. Сб. ст., М., 1970.

ІАНІЗАЦЫЙНАЯ КА́МЕРА, герметычная камера з двума (часам трыма) ізаляванымі электродамі, запоўненая газамі ці газавымі сумесямі, якая выкарыстоўваецца для рэгістрацыі, вымярэння і даследавання выпрамянення.

Выпрамяненне пранікае ў камеру праз яе сценкі ці спец. дыяфрагму, адбываецца *іанізацыя* атамаў (ці малекул) газу і ўзнікае іанізацыйны ток, які рэгіструецца гальванометрам ці інш. вымяральнымі прыладамі. У залежнасці ад схемы, якая выкарыстоўваецца для вымярэння іанізацыйнага току, І. к. бываюць двух тыпаў: для выяўлення асобных зараджаных часцінак (напр., лічыльнік іанізацыйныя ці імпульсныя камеры) і для вымярэння інтэнсіўнасці патоку выпрамянення (напр., інтэгруючыя камеры). Гл. таксама *Лічыльнікі зараджаных часцінак.*

Літ.: Иванов В. И. Дозиметрия ионизирующих излучений, М., 1964; Калашникова В. И. и Козодаев М. С. Детекторы элементарных частиц, М., 1966. *І. У. Косціна.* Мінск.

ІАНІЗА́ЦЫЯ, утварэнне дадатна або адмоўна зараджаных часцінак *(іонаў)* з нейтральных атамаў ці малекул.

Адбываецца І. ў рэчыве пад уплывам моцнага эл. поля, высокіх т-р, а таксама ад дзеяння ўдараў хуткіх зараджаных часцінак і фатонаў у выніку таго, што атам ці малекула набывае лішкавую энергію, дастатковую для вылучэння электрона. Пры І. газу з атамаў або малекул узнікаюць дадатны іон і свабодны электрон, якія астаюцца свабоднымі ці далучаюцца да інш. нейтральных атамаў або малекул, утвараючы комплексныя іоны. І. ў цвёрдых целах — гэта пераход электронаў з атамаў асн. рэчыва ці з прымесных цэнтраў у зону праводнасці.. Гл. таксама *Зонная тэорыя, Электраправоднасць.*

Літ.: Гапонов В. И. Электроника, ч. 1, М., 1960.

ІАНІТЫ, цвёрдыя, нерастваральныя ў вадзе і арган. растваральніках рэчывы, здольныя да *іоннага абмену.* Бываюць мінеральныя (прыродныя алюмасілікаты, пермутыты) і арганічныя (гумінавыя к-ты глебы, іонаабменныя смолы).

І. змяшчаюць іанагенныя (здольныя да *электралітычнай дысацыяцыі*) групы, фіксаваныя на палімернай матрыцы (гл. *Іоны*). Паводле тыпу груп І. дзеляць на нерастваральныя к-ты — катыяніты, асновы — аніяніты і амфатэры — поліамфаліты. Паводле ступені *іанізацыі* — на моцныя і слабыя. Калі І. маюць іанагенныя групы аднаго віду, іх наз. монафункцыянальнымі, калі розныя групы — поліфункцыянальнымі. Ужываюцца там, дзе трэба раздзяляць рэчывы ці вылучаць іх з раствору, напр. для змякчэння вады, вылучэння урану і медзі з рудаў, у выт. антыбіётыкаў, для раздзялення рэдказямельных элементаў.

Літ.: Салдадзе К. М., Пашков А. Б. и Титов В. С. Ионообменные высокомолекулярные соединения, М., 1960; Гельферих Ф. Иониты, пер. с нем., М., 1962. *У. С. Салдатаў.* Мінск.

ІАНІЧНЫ О́РДЭР, адзін з трох асноўных архітэктурных ордэраў; гл. *Ордэры.*

ІАРДА́Н (Jordanis), гісторык готаў 6 ст. Служыў у аланскага военачальніка, пазней, як мяркуюць, стаў епіскапам. Гал. праца І. «Пра паходжанне і справы гетаў» («De origine actibusque Getarum») — важная крыніца па гісторыі готаў, Паўн. Прычарнамор'я і ўсяго перыяду. Вял. перасяленне народаў. Пераказаў падзеі, апісаныя гоцкім гісторыкам Касіядорам, выкарыстаў таксама эпас готаў, асабістыя назіранні. Праца мае кашт. звесткі з гісторыі інш. народаў і плямёнаў, у т. л. стараж. славян.

Тв.: Рус. пер.— О происхождении и деяниях гетов, М., 1960.

ІАРДА́НІЯ (Хашымі́цкае Каралеўства Іарданіі), дзяржава на Б. Усходзе. Пл. 97,7 тыс. *км*². Нас. 2348 тыс. чал. (1971). Сталіца Аман (583 тыс. ж., 1971). Краіна падзяляецца на 8 губернатарстваў (мухафазаў). І.— канстытуцыйная манархія. На чале дзяржавы кароль. Дзейнічае канстытуцыя 1952. Заканадаўчая ўлада належыць парламенту, які складаецца з 2 палат — сената і палаты дэпутатаў (кароль карыстаецца правам вета), выканаўчая ўлада — ураду на чале з прэм'ер-міністрам.



Іарданія. Рака Іардан.



Прырода. Асн. частка І. занята пустынным пласкагор'ем (800—1300 *м*) з асобнымі ўзвышэннямі да 1754 *м* над узр. м. (г. Рам на Пд). У зах. частцы пласкагор'я з Пн на Пд цягнецца глыбокая тэктанічная ўпадзіна Эль-Гор з далінаю р. Іардан з урадлівымі і найб. абжытымі землямі. Радовішчы фасфатаў, жал. руды, марганцу. Клімат субтрапічны з сухім і гарачым летам. Т-ра паветра ад 7 да 12 °С у студз. і ад 23 да 28 °С у ліпені. Ападкаў 500—700 *мм* за год на З і каля 100 *мм* на У. Большасць рэк не мае пастаяннага вадасцёку. Найб. рэкі: Іардан і яго прыток Ярмук. Самае вял. возера — Мёртвае мора. Раслінасць, акрамя зах. часткі краіны, паўпустынная і пустынная, пераважаюць нізкія хмызнякі і травы. Трапляюцца рэдкія аазісы з фінікавай пальмай. Жывёльны свет: ваўкі, пустынныя лісы, шакалы, гіены, многа грызуноў, яшчарак.

Насельніцтва. Большасць насельніцтва (80%) арабы, ёсць чэркесы, грэкі, курды і інш. Значная колькасць палесцінскіх бежанцаў. Дзярж. мова арабская, рэлігія — іслам, каля 10% нас.— хрысціяне. Сярэдняя шчыльн. 22,4 чал. на 1 *км*². Найб. густа заселена зах. частка краіны. 40% нас. жыве ў гарадах. Вял. гарады: Аман, Іерусалім, Наблус, Ірбід.

Аман. Агульны выгляд.



Гістарычная даведка. У старажытнасці тэр. сучаснай І. насялялі семіцкія плямёны хананеяў. У 3—2-м тысячагоддзях да н. э. на іх нападалі фінікійцы, хеты і інш. У 2-й пал. 2-га тысячагоддзя да н. э. І. была ў складзе Ізраільска-Іудзейскага царства. У канцы 1-га тысячагоддзя да н. э.— цэнтр стараж. арабскай Набатэйскай дзяржавы. З 4 ст. тэр. І. ўваходзіла ў склад Візант. імперыі, у 7 ст. заваявана арабамі, стала часткай Араб. халіфата. На тэр. І. пашыраўся іслам і араб. мова. Развіваліся феад. адносіны. У 11—15 ст. тэр. І. была пад уладай крыжакоў, сельджукаў, егіп. мамлюкоў. З пач. 16 ст. да 1918 у складзе Асманскай імперыі. У 1920 уключана ў брыт. мандат на Палесціну, з якой у 1921 быў вылучаны як англ. падмандатная тэр. эмірат Трансіарданія. На пач. 2-й сусв. вайны тэр. эмірата стала адным з асн. брыт. плацдармаў на араб. Усходзе. У 1946 Англія была вымушана адмовіцца ад мандата і прызнаць эмірат незалежным каралеўствам, але захавала ў І. важныя пазіцыі. У выніку араба-ізраільскай вайны 1948—49 усх. раёны Палесціны ўвайшлі ў склад І., якая атрымала назву Хашыміцкае Каралеўства Іарданіі. У краіне паявілася больш за 500 тыс. палесцінскіх бежанцаў з тэрыторый, захопленых Ізраілем. У пач. 50-х г. ЗША ўзмацнілі пранікненне ў І. У 1954 узнікла прагрэс. паліт. арганізацыя Нац. фронт. На парламенцкіх выбарах 1956 перамог блок патрыят. арг-цый. Урад на чале з Сулейманам Набулсі пачаў праводзіць курс незалежнай знешняй палітыкі: у пач. 1957 дамогся згоды Англіі на анулляванне нераўнапраўнага дагавору 1948 і вывад англ. войск з І. Рэакц. колы дамагліся ў 1957 адстаўкі ўрада Набулсі. Забаронена дзейнасць паліт. партый, прагрэс. арганізацый, прафсаюзаў. Каб не дапусціць рэвалюц. выступленняў нар. мас пад уплывам іракскай рэвалюцыі (1958), Англія ўвяла ў І. свае войскі, але пад націскам сусв. грамадскасці мусіла іх вывесці. У 1962 І. абвясціла палітыку недалучэння да блокаў. 20.8. 1963 устаноўлены дыпламат. адносіны з СССР. Паводле закону аб працы 1965 расшыраны правы рабочых, прыняты закон аб амністыі палітзняволеных і палітэмігрантаў.

У 1967 на І. напаў Ізраіль (гл. *Ізраільская агрэсія*). У выніку агрэсіі Ізраіль акупаваў 5,9 тыс. *км*² тэр. І., якая давала каля 38% валавога прадукту краіны. Колькасць палесцінскіх бежанцаў у І. выраслa да 1 млн. чал.



Масавы мітынг у Амане супраць ізраільскай агрэсіі. 1968.

Пасля чэрв. 1967 пачаўся пэўны ўздым дзейнасці грамадскіх арг-цый. У І. базіраваліся атрады палесцінскага супраціўлення ізраільскім акупантам. Пасля ўзброеных сутычак з урадавымі войскамі яны перайшлі на тэр. суседніх араб. дзяржаў (ліп. 1971). І. расшырае супрацоўніцтва з арабскімі і сацыяліст. краінамі, выступае за вырашэнне блізкаўсходняга канфлікту паліт. сродкамі. У авангардзе барацьбы за ліквідацыю вынікаў агрэсіі ідзе кампартыя І. (засн. ў 1943). У 1967 падпісана пагадненне аб культ. і навук. супрацоўніцтве з СССР, у 1969 — пагадненне аб эканам. і тэхн. супрацоўніцтве. З снеж. 1955 чл. ААН.

Гаспадарка. І.— адсталая агр. краіна. Пад ворывам 11,7% тэрыторыі, паша пераважна ў пустыні. Лепшыя с.-г. землі, крыніцы арашэння належаць памешчыкам (шэйхам). Характэрны дробныя сялянскія гаспадаркі. Вял. страты эканоміцы І. прычыніла акупацыя Ізраілем заходніх, найбольш развітых раёнаў. Вырошчваюць (збор, без уліку плошчаў, захопленых Ізраілем, тыс. *т*, 1969) пшаніцу — 144,3, ячмень — 41,8, масліны — 23,6, тытунь, бабовыя, раннюю агародніну і садавіну. У 1969 было (тыс. галоў): авечак 854, коз 527, буйн. раг. жывёлы 49, вярблюдаў 13. У пустынных і паўпустынных раёнах жывёлагадоўля качавога характару. Непадалёку ад Амана здабываюцца фасфарыты (1,2 млн. *т*, 1969). Вытворчасць эл. энергіі 199,8 млн. *квт·гадз* (1969). Прамысловасць мае самастойны характар. Найб. развіта харч., цэментавая (480,6 тыс. *т*, 1968), тытунёвая прамысловасць. Аўтазборачны і нафтаперапрацоўчы (г. Эз-Зарка) з-ды, майстэрні апрацоўкі мармуру. Прамысловасць і с. гасп. не забяспечваюць патрэб краіны, і І. прывозіць большасць прамысл. і харч. тавараў. Знешнія перавозкі абслугоўваюцца марскім транспартам праз порт Акаба, унутраныя — аўтатранспартам. Шашэйных дарог (1967) каля 4300 *км*, чыгунак каля 450 *км*. Экспарт: фасфарыты, агародніна, садавіна, тытунь і тытунёвыя вырабы, жывёла. Імпарт: чорныя металы, машыны, тэкст. вырабы, пшаніца, нафта і нафтапрадукты. Асн. партнёры: у экспарце — Кувейт, Ліван, Сірыя; у імпарце — ЗША, ФРГ, Вялікабрытанія. Грашовая адзінка — іарданскі дынар.

Асвета. Паводле закону ад 1952 уведзена абавязковае бясплатнае пачатковае навучанне, аднак існуюць цяжкасці ў яго ажыццяўленні. Побач з дзяржаўнымі школамі ёсць прыватныя і рэлігійныя. Дашкольныя ўстановы для дзяцей 3—6 гадоў платныя. Пач. школа 6-гадовая (з 6—7 да 12—13 гадоў). Сярэдняя школа 5-гадовая, мае 2 ступені (2 і 3 гады). Навучанне ў гарадах раздзельнае, у сельскай мясцовасці сумеснае. У 1967/68 навуч. г. ў пач. школах вучылася 369,7 тыс. дзяцей, у сярэдніх 126 тыс. чал. Асобнае месца займаюць навуч. ўстановы для дзяцей палесцінскіх бежанцаў (у сувязі з агрэсіяй Ізраіля), арганізаваныя Блізкаўсх. агенцтвам ААН; заняткі ў іх вядуцца па праграме, распрацаванай ЮНЕСКО. У 1962 засн. Іарданскі ун-т. У Амане археалагічны музей, публічная бібліятэка.

Літ.: Лебедев Е. А. Иордания в борьбе за независимость, М., 1956; Котлов Л. Н. Иордания в новейшее время, М., 1962; Современная Иордания, М., 1964; Новейшая история арабских стран (1917—1966), М., 1968.

ІАСКЕ́ВІЧ Іван Фёдаравіч [27.2(11.3).1898, в. Белякоўшчына Гродзенскага пав.— 8.8.1964], генерал-лейтэнант (1946). З сялян. Чл. КПСС з 1940. Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1938). У арміі з 1916, у Чырв. Арміі з лютага 1918. Удзельнік грамадз. вайны, барацьбы з басмацтвам. У Айч. вайну на Зах., Закаўказскім, Паўн.-Каўказскім і 1-м Бел. франтах: нач. штаба і камандзір дывізіі, нам. камандзіра корпуса. Удзельнік баёў на Каўказе, у Крыме, вызвалення Гомеля, Рэчыцы, Баранавіч. У 1945—47 у Войску Польскім. З 1947 нач. кафедры Ваен.-паветр. інж. акадэміі імя Жукоўскага. З 1955 у адстаўцы. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 4 інш. ордэнамі, медалямі, 2 ордэнамі ПНР.



ІАЎЧУК Міхаіл Трыфанавіч [н. 6(19).11.1908, в. Заўжоўе Кобрынскага пав. Гродзенскай губ.], савецкі філосаф. Чл.-кар. АН СССР (1946). З сялян. Чл. КПСС з 1926. Скончыў Акадэмію камуніст. выхавання (1931). У 1933—36 і ў 1939—49 на парт. рабоце. З сак. 1947 да лютага 1949 сакратар ЦК КП(б)Б, чл. Бюро ЦК КП(б)Б. З 1936 кіраваў кафедрамі філасофіі шэрагу ВНУ, з 1953 праф. Маскоўскага ун-та. З 1958 гал. рэдактар час. «Научные доклады высшей школы. Философские науки». З 1970 рэктар Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС. Даследуе праблемы гісторыі філасофіі, гісторыі марксізма-ленінізма, гістар. матэрыялізму. Адзін



з аўтараў і рэдактараў 6-томнай «Гісторыі філасофіі» і «Філасофскай энцыклапедыі». На XXIV з'ездзе КПСС выбраны канд. у чл. ЦК. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР 2-га скл. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 4 інш. ордэнамі, медалямі.

Тв.: Белинский. Его философские и социально-политические взгляды, М., 1939; Развитие материалистической философии в России в XVIII—XIX вв., М., 1940; Основные черты русской классической материалистической философии XIX в., Мн., 1949; Философские и социологические взгляды Н. П. Огарева, М., 1957; Г. В. Плеханов и его труды по истории философии, М., 1960; История философии как наука, ее предмет, метод и значение, М., 1960; Ленинский этап в развитии марксизма и его философии, М., 1969; Актуальные проблемы истории марксистской философии и ленинского этапа ее развития, у кн.: Ленинизм и современные проблемы историко-философской науки, М., 1970.

ІАШКАР-АЛА́ (па-марыйску Чырвоны горад, да 1919 Царевакакшайск, да 1927 Чырвонакакшайск), сталіца Марыйскай АССР, на р. Малая Какшага (прыток Волгі). Чыг. станцыя, вузел аўтамаб. дарог. 166 тыс. ж. (1970). З-ды: паўправаднікоў, электрааўтаматычны, гандл. і лясной машынабудавання, штучнай скуры, вітамінны; ф-кі: абутковая, мэблевая, кандытарская, макаронная, швейная; мясакамбінат. Вытворчасць буд. матэрыялаў. Політэхн. і пед. ін-ты, НДІ гісторыі, мовы і л-ры. 6 сярэдніх спец. навуч. устаноў. Краязнаўчы музей. 3 тэатры (марыйскі, рускі драм., лялечны).

Засн. ў 1584. З 1708 у складзе Казанскай губ., з 1781 павятовы горад. Сав. ўлада ўстаноўлена 23.12.1917 (5.1.1918). З 1920 адм. ц. Марыйскай а. в. РСФСР, з 1936 сталіца Марыйскай АССР.

ІБА́ДАН (Ibadan), горад на ПдЗ Нігерыі, у вярхоўі р. Ана. Адм. ц. Зах. правінцыі. Адзін з буйных гарадоў краіны. Засн. ў канцы 18 ст. Вузел чыг. і аўтамаб. дарог. Аэрапорт. 728 тыс. ж. (1969). Важны гандл. цэнтр с.-г. раёна (какава, бавоўна, рыс, садавіна). Дрэва- і металаапр. прамысловасць; з-ды фруктовых сокаў і кансерваў; вытв. аўтапакрышак, пальмавага алею. Развіты рамёствы (ткацтва, фарбаванне і інш.). Ун-т.

ІБА́РУРЫ (Ibárruri) Далорэс (н. 9.12.1895, Гальярта правінцыі Біская), дзеяч іспанскага і міжнар. рабочага руху. З сям'і гарняка. З 1917 чл. сацыяліст. арг-цыі г. Самаростра, выступала ў рабочым друку пад імем Пасіянарыя (Палымяная). Адна з арганізатараў *Камуністычнай партыі Іспаніі* (КПІ), рэдактар шэрагу камуніст. газет. З 1930 чл. ЦК; з 1932 чл. Палітбюро (з 1960 Выканкома) КПІ. Актыўны змагар за ўмацаванне партыі, супраць рэакцыі і за стварэнне антыфаш. Нар. фронту. У 1931—33 адзін з рэдактараў цэнтр. органа КПІ газ. «Mundo Obrero» («Рабочы свет»). За рэвалюц. дзейнасць няраз арыштоўвалася, сядзела ў турмах. У 1935 выбрана кандыдатам у чл. Выканкома Камінтэрна.



Пасля перамогі Нар. фронту ў Іспаніі з 1936 дэпутат, з 1937 віцэ-старшыня картэсаў. У нац.-рэвалюц. вайну ісп. народа (1936—39) узначальвала аддзел масавай работы ЦК, была нам. ген. сакратара ЦК КПІ, шмат зрабіла для стварэння рэсп. арміі. З 1939 у эміграцыі. З 1942 ген. сакратар, з 1960 старшыня КПІ. Віцэ-старшыня Выканкома Міжнар. дэмакр. федэрацыі жанчын (з 1945). Аўтар шэрагу работ і публіцыстычных артыкулаў, узначальвала камісію ЦК па складанні гісторыі КПІ (выйшла ў 1960). Прысутнічала на XVII, узначальвала дэлегацыі КПІ на XIX—XXIV з'ездах КПСС, прысутнічала на Нарадах камуніст. і рабочых партый у Маскве 1957, 1960 і 1969.

Тв.: Рус. пер.— Октябрьская социалистическая революция и испанский рабочий класс..., М., 1960; Единственный путь, М., 1962; В борьбе. Избр. ст. и выступления, М., 1968.

Літ.: Благоева С. Народный трибун Испании Долорес Ибаррури (Пасионария), [М.], 1937.

ІБА́РУРЫ Рубен Руіс (18.1.1920, г. Самаростра ў Іспаніі — 2.9.1942), Герой Сав. Саюза (1956). Сын *Ібаруры* Далорэс. Чл. ВЛКСМ. З 1935 жыў у СССР у сям'і П. М. і В. Б. Лепяшынскіх. Удзельнік нац.-рэвалюц. вайны ў Іспаніі (1939). Быў зняволены ў канцлагер, адкуль у 1939 уцёк у СССР. У Чырв. Арміі з 1940. 1.7.1941 на чале кулямётнай роты прыняў бой на р. Бярэзіна каля Барысава, паранены. За мужнасць у гэтым баі ўзнаг. ордэнам Чырв. Сцяга. Удзельнік Сталінградскай бітвы. 24.8.1942 адбіў 5 контратак праціўніка, у баі замяніў камандзіра батальёна, быў смяртэльна паранены. Пахаваны ў Валгаградзе.

ІБЕРЫЙСКА-КАЎКАЗСКІЯ МОВЫ, сям'я моў, якімі карыстаюцца народы Каўказа. Большасцю вучоных лічацца сваяцкімі. Пытанне роднасці І.-к. м. з інш. мовамі свету канчаткова не высветлена. І.-к. м. распадаюцца на 4 агалінаванні: абхаза-адыгскія, картвельскія, дагестанскія, вейнахскія (нахскія) мовы. У СССР на І.-к. м. гаворыць каля 4,4 млн., у Турцыі і Іране каля 250 тыс. чал. Найб. пашырана *грузінская мова*. Належыць да картвельскай групы, мае стараж. пісьменнасць. У гады Сав. улады сталі літаратурнымі абазінская, абхазская, аварская, адыгейская, даргінская, інгушская, кабардзінская, лакская, лезгінская, табасаранская і чачэнская. Алфавіты гэтых моў складваліся на аснове арабскай і лацінскай графікі, у 1936—39 пераведзены на рускую. Астатнія 25 моў бяспісьменныя (занская і сванская з картвельскай групы, бацбійская — з нахскай, убыхская — з абхаза-адыгскай, а таксама шэраг дагестанскіх моў).

Асаблівасць фанетыкі І.-к. м.— багатая сістэма зычных (асабліва ў абхаза-адыгскіх і дагестанскіх мовах: у убыхскай мове, напр., 82 зычныя); у сістэме зычных звычайна выступаюць тройкі выбуховых і афрыкат, што складаюцца са звонкага, прыдыхальнага і выбухова-гартаннага, а таксама пары фрыкатыўных, якія складаюцца з глухога і звонкага; часта сустракаюцца задняя, гартанныя, падчас ларынгальныя зычныя. Марфалогія І.-к. м. аглюцінатыўная (з элементамі фузіі ў нахскіх і дагестанскіх і з'явамі полісінтэтызму ў абхаза-адыгскіх мовах). Прэфіксальны лад — агульнакаўказская рыса словазмянення і словаўтварэння. *Именныя классы* былі раней уласцівыя ўсім І.-к. м.

Асаблівасць сінтаксісу І.-к. м.— наяўнасць эргатыўнай канструкцыі сказа. Лексіка мае мала агульных спрадвечна родных слоў, але ўключае шмат агульных запазычанняў з арабскай, іранскай, цюркскіх і інш. моў, а таксама вялікі пласт інтэрнацыяналізмаў, запазычаных праз рус. мову.

Літ.: Языки народов СССР, т. 4, М., 1967; Климов Г. А. Кавказские языки, у кн.: Советское языкознание за 50 лет, М., 1967 (бібліягр.).

А. Я. Супрун. Мінск.

ІБІСЫ (Ibididae), сямейства птушак атр. галянастых. Даўж. цела 51—83 *см*, маса 0,5—2 *кг*. Ногі доўгія, дзюба доўгая, загнутая ўніз або расшыраная на канцы. 31 від. Пашыраны пераважна ў трапічным і ўмераным паясах. У СССР 4 віды. На Беларусі трапляюцца *каравайка* і *коўпіца*.

ІБН СІНА Абу Алі [латынізаванае Авіцэна (Avicenna); каля 980, с. Афшана каля Бухары — 18.6.1037], філосаф, урач, прыродадаследчык і паэт усходняга сярэдневякоўя. Па паходжанні таджык. Пісаў на араб. мове і фарсі (дары) — літ. мове стараж. таджыкаў і персаў. Жыў у Бухары, Харэзме, Іране. Зрабіў вялікі ўплыў на развіццё арабамоўнай і еўрап. філас. і навук. думкі. Найважнейшыя творы: «Медычны канон», «Кніга збавення» (ч. 1—18), «Кніга ведаў» (на мове фарсі). Філас. погляды І. С. спалучалі матэрыяліст. тэндэнцыі з тэолага-ідэаліст. палажэннямі. Апіраючыся на філасофію Арыстоцеля і развіваючы матэрыяліст. ідэі яе, прызнаваў аб'ектыўнасць, вечнасць быцця, непарушную сувязь матэрыі і руху. Пры вывучэнні прыроды адстойваў прынцып адзінства мыслення і доследных ведаў, але адрываў розум ад матэрыяльнага субстрату, сцвярджаў існаванне свету ідэй незалежна ад свету рэчаў. Аўтар прац па логіцы. Стварыў арыгінальную класіфікацыю навук, выклаў агульныя тэорыі па медыцыне, анатоміі, фізіялогіі, хірургіі, дыягностыцы. Даследаваў праблемы руху, інерцыі, паходжання жывёльнага свету. Філас. думкі выкладаў і ў паэт. форме (вялікая «Касыда аб душы» і інш.). Большасць вершаў на фарсі напісана ў форме рубаі. Паэзіі І. С. ўласцівыя афарыстычнасць, прастата. Аўтар філас. аповесцей «Жывы, сын Неспакойнага», «Пасланне пра птушку» і інш. Напісаў каментарыі да «Паэтыкі» Арыстоцеля, тлумачэнне вершаў араб. паэта Ібн ар-Румі. Герой тадж., тур., узб. і туркм. фальклору.



Тв.: Рус. пер.— Канон врачебной науки, кн. 1—5, Ташкент, 1954—60; Даниш-намэ, Сталинабад, 1957; Четверостишия, «Литературный Таджикистан», 1953, кн. 5; Математические главы «Книги знания» (Донишнома), Душанбе, 1967.

Літ.: Терновский В. Н. Ибн Сина (Авиценна), М., 1969; Смирнова-Ракитина В. А. Ибн Сина (Абу-Али ибн Сина), М., 1958; Семенов А. А. Абу-Али ибн Сина (Авиценна), 2 изд., [Сталинабад], 1953.

ІБРАГІМАВА Зоя Ісмаілаўна [н. 12(25).12. 1914, г. Каінск Томскай губ.], беларускі савецкі вучоны ў галіне нармальнай анатоміі. Д-р мед. н., праф. (1947). Чл. КПСС з 1967. Скончыла Узбекскі ун-т (1936). Выкладчык Ваен.-мед. акадэміі імя Кірава (1942—44), заг. кафедры нармальнай анатоміі Яраслаўскага (1946—52) і Віцебскага (з 1952) мед. ін-таў. Прапанавала метад апрацоўкі прэпаратаў акрылавымі смоламі. Асн. працы па асаблівасці будовы сярэд. і ўнутр. вуха і іх кровазварот. Узнаг. ордэнам «Знак Пашаны».

Тв.: Редкая аномалия костного внутреннего уха человека, «Труды Узбекского гос. ун-та. Новая серия», 1940, № 2, в. 2; Об особенностях васкуляризации лабиринта, у кн.: XIX итоговая научная сессия Витебского гос. мед. ин-та, Витебск, 1961.

ІБРАГІМАЎ Алі Ізмайлавіч [н. 18.9(1.10). 1913, с. Усць-Кара Забайкальскай вобл.), савецкі дзярж. і парт. дзеяч. Старшыня Савета Міністраў Азерб. ССР. З сялян. Чл. КПСС з 1943. Скончыў Азерб. індустрыяльны ін-т (1937). З 1932 на з-дзе, тэхнік, нач. цэха. З 1941 гал. інжынер, з 1943 дырэктар машынабудаўнічага з-да, у 1946—48 кіраўнік трэста «Азнафтамаш», з 1948 у апараце ЦК КП Азербайджана. З 1950 старшыня, у 1953 першы нам. старшыні, з 1954 старшыня Дзяржплана Азерб. ССР. У 1963—65 старшыня Планавай камісіі Закаўказскага эканам. р-на. З 1965 першы нам. старшыні, з крас. 1970 старшыня Савета Міністраў Азерб. ССР. На XXIV з'ездзе КПСС выбраны канд. у чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета СССР 6—8-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, 3 інш. ордэнамі.



ІБРАГІМАЎ Мірза Аждар аглы [н. 15(28).10. 1911, с. Эва Сарабскага махала, Паўд. Азербайджан], азербайджанскі савецкі пісьменнік і грамадскі дзеяч. Нар. пісьменнік Азербайджана (1961), акад. АН Азерб. ССР (1945). Чл. КПСС з 1930. З сялян. Друкуецца з 1930. Аўтар рамана «Настане дзень» (1948, Дзярж. прэмія СССР 1950), аповесцей «Гюлебетын» (1965), «Буравеснік» (1966) пра нар.-вызв. барацьбу ў Іранскім Азербайджане і Іране. Раман «Вялікая апора» (1957) пра паслявае. калгасную вёску, «Перване» (1970) пра рэвалюц. барацьбу ў Азербайджане. Напісаў п'есы: «Хаят» (паст. 1935) пра калектывізацыю вёскі, «Мадрыд» (паст. 1938) пра гераічную барацьбу ісп. народа, «Махабат» (паст. 1942) пра Айч. вайну, «Нязгасныя кастры» (паст. 1967) пра рэвалюц. змаганне ў Азербайджане. Пытанням новай маралі прысвяціў камедыі «Вясковая дзяўчына» (паст. 1962) і «Добры чалавек» (паст.



1965). Вядомы як публіцыст і літаратуразнавец. Творы І. перакл. на многія мовы народаў СССР і за мяжою. Быў старшынёй Прэзідыума Вярх. Савета Азерб. ССР (1954—58). З 1965 старшыня праўлення СП Азербайджана. Дэп. Вярх. Савета СССР 1—5; 7—8-га скл. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі.

Тв.: Бел. пер.— Настане дзень, Мн., 1953; рус. пер.— Избр. произв., т. 1—2, М., 1958; Слияние вод, М., 1964; На склонах Муровдага. Рассказы, М., 1967; Заметки о литературе, М., 1971.

Літ.: Даронян С. Мирза Ибрагимов, М., 1960; Очерк истории азербайджанской советской литературы, М., 1963.

А. С. Багіраў. Баку.

ІБРАГІМАЎ Тымірбек (1922, с. Джымнургап Чымкенцкага пав. Сырдар'інскай вобл.— 15.10.1943), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). На фронце з 1942. Вызначыўся 15.10.1943. У складзе групы разведчыкаў фарсіраваў Дняпро каля Лоева Гомельскай вобл., захапіў варожую траншэю, адбіў 3 атакі. Загінуў у гэтым баі.

ІБРАЕЎ Айткет Абаевіч (1924, в. Кзыл-Куйгам Сяміпалацінскага пав. Кірг. АССР — 6.7.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1944. Вызначыўся ў ліп. 1944 у баях пад Мінскам. Агнявы ўзвод І. знішчыў каля в. Шэметава, Пекалін 6 процітанкавых гармат, 12 кулямётных кропак, 19 аўтамашын, 55 падвод з боепрыпасамі. Загінуў у баі.

ІБСЕН (Ibsen) Генрык (20.3.1828, г. Шыен — 23.5.1906), нарвежскі драматург. У 1851—57 маст. кіраўнік і рэжысёр Бергенскага нарв. тэатра, у 1857—64 — нац. тэатра ў Хрысціяніі. У 1864—91 жыў за мяжой (Італія, Германія). Рамант.-бунтарскія вершы («Да венграў», «Абуджайцеся, скандынавы!») і вершаваная драма «Катыліна» (1850) — водгук на бурж. рэв. 1848—49. Пад уплывам нац.-вызв. руху ў Нарвегіі напісаў рамант. драмы на сюжэты з нац. гісторыі, стараж.-сканд. сагаў і легендаў («Фру Інгер з Эстрата», паст. 1855, апубл. 1857; «Баль у Сульхаўгу», 1856; «Барацьба за трон», 1864; і інш.). Аўтар філас. драм. паэм «Бранд» (1866) і «Пер Гюнт» (1867). Вяршыня рэаліст. мастацтва І.— сац.-псіхал. драмы «Стаўпы грамадства» (1877), «Лялечны дом» (1879), «Здані» (1881), «Вораг народа» (1882). Познія псіхал. драмы «Дзікая качка» (1884), «Росмерсхальм» (1886), «Жанчына з мора» (1888), «Калі мы, мёртвыя, абуджаемся» (1899) вызначаюцца абстрактна-філас. абагульненнямі; рэаліст. фантастыка і сімволіка ў іх спалучаюцца з містычнымі дэкадэнцкімі матывамі. Найлепшым творам І. ўласцівыя тонкасць і трапнасць псіхал. характарыстык, дэмакратызм, страсная абарона правоў чалавека, глыбіня пастаноўкі вострых сац.-псіхал. праблем. Т-р імя Я. Купалы паставіў п'есу «Нора» («Лялечны дом», 1954), т-р імя Я. Коласа — «Здані» (1940).



Тв.: Рус. пер.— Собр. соч., т. 1—4, М., 1956—58.

Літ.: Адмони В. Г. Генрик Ибсен, М., 1956; Генрик Ибсен. Биобиблиогр. указатель, М., 1956.

ІВАКІ, вёска ў Добрушскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Івакі». Чыг. ст. на лініі Гомель — Бахмач (УССР). За 47 *км* на Пд ад Добруша, 30 *км* ад Гомеля. 1553 ж., двароў 487 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, дзіцячы сад, фельч.-ак. пункт, адда. сувязі, магазін. У 1941 вёску спалілі нямецка-фаш. захопнікі. Помнік на магіле сав. воіна, які загінуў у Вял. Айч. вайну.

ІВАЛГІ (Oriolus), род птушак сям. івалгавых атр. вераб'іных. Пашыраны ў Паўд. і Сярэдняй Еўропе, Азіі, Паўн.-Зах. Афрыцы. У СССР 2 віды, на Беларусі 1: звычайная І. (O. oriolus, нар. назва на Палессі — жаўна).



Івалга звычайная.

Даўж. І. 24—27 *см*, маса 70—90 *г*. Апярэнне І. звычайнай шараватавялёнае (у самкі) і лімонна-жоўтае (у самца). Крылы і хвост чорныя. Пералётная птушка. Гняздуецца ў лісцевых і мяшаных лясах, садах. Гнёзды ў кронах дрэў. Нясе 3—4 яйцы. Наседжвае 14—15 дзён. Корміцца пераважна насякомымі, многія з якіх небяспечныя шкоднікі лясной і с. гасп. Пле надзвычай гучна і меладычна.

Літ.: Гл. пры арт. *Вераб'іныя*.

ІВАН I Данілавіч Каліта (г. н. невяд.— п. 1340), князь маскоўскі [з 1325], вял. князь уладзімірскі [1328—40]. Праводзіў асцярожную палітыку адносна Залатой Арды. З яе дапамогаю задушыў нар. паўстанне ў Цверы (1327), атрымаў ярлык на вял. княжанне (1328). Пачаў аб'яднанне рус. зямель вакол Масквы. Пашырыў уплыў на Паўн.-Усх. Русь. Пры ім пачалося ўзмацненне вялікакняскай улады, Масква стала цэнтрам царкоўнага кіравання. Сабраў вялікія багацці (адсюль прозвішча «Каліта» — грашовая торба). У час кіравання І. І часова спыніліся феад. ўсобіцы.

Літ.: Тихомиров М. Н. Средневековая Москва в XIV—XV вв., М., 1957; Черепнин Л. В. Образование Русского централизованного государства в XIV—XV вв., М., 1960.

ІВАН II Іванавіч Красны (Прыгожы) (1326—59), рускі князь, сын *Івана I* Каліты, князь звенігародскі і рузскі [1340—53], вял. князь маскоўскі і ўладзімірскі [1353—59]. Прадаўжаў палітыку аб'яднання рус. зямель.

ІВАН III Васілевіч (22.1.1440—27.10. 1505), вялікі князь маскоўскі [1462—1505], сын *Васіля II* Васілевіча Цёмнага. Пры ім у асноўным завершана аб'яднанне рус. зямель вакол Масквы; далучаны Яраслаўскае (1463), Растоўскае (1474), Цвярское вял. (1485) княствы, Ноўгарадская феад. рэспубліка (1478), Вяцкая (1489) і часткова Разанская землі; канчаткова скінута манголатат. няволя (1480). Склаўся цэнтралізаваны апарат улады (прыказы), развівалася маянт-

ковае землеўладанне, расла паліт. роля дваранства, юрыдычна афармлялася запрыгоньванне сялян, складзены Судзебнік 1497 (гл. *Судзебнікі*). Перабудаваны Маскоўскі Крэмль. Пры І. III вяліся войны з Лівоніяй (1501—03) за выхад да Балтыйскага м. і Вял. кн. Літоўскім за ўз'яднанне рус. зямель. У ліп. 1500 рус. войскі перамаглі армію Вял. кн. Літ. на р. Вядрошы (каля Дарагабужа). Саюзнік І. III крымскі хан Менглі-Гірэй у 1502, 1503, 1505 рабіў спусташальныя набегі сваіх ордаў на Украіну і Беларусь. У выніку войнаў 1487—94, 1500—03 з Вял. кн. Літ. да Масквы далучаны Вязьма, Масальск, Бялёў, Чарнігаў, Ноўгарад-Северскі, Бранск, Курск, Таропец, Гомель (да 1537); установлены дыпламат. зносіны з многімі краінамі Еўропы і Азіі.

Літ.: Базилевич К. В. Внешняя политика Русского централизованного государства. Вторая половина XV в., М., 1952; Черепнин Л. В. Образование Русского централизованного государства в XIV—XV вв., М., 1960. *А. П. Грыцкевіч.* Мінск.

ІВА́Н IV Васі́левіч Гро́зны (25.8.1530—18.3.1584), вял. князь усяе Русі [з 1533], першы рускі цар [1547—84], сын *Васіля III* Іванавіча. У 1533—38 рэгенткай была яго маці Алена Глінская, у 1538—48 кіравалі баярскія групоўкі Шуйскіх, Бельскіх, Глінскіх. Самастойна правіў з 1549. Апіраўся на дваранства і вярхі гараджан. Каб умацаваць самадзяржаўе, у 50—60-я г. ажыццявіў рэформы: цэнтр. і мясцовага кіравання (скасавана сістэма намеснікаў, т. зв. «кармленне»), арміі, суда, фінансаў і інш.



Для барацьбы з рэшткамі феад. раздробленасці і баярскай апазіцыяй увёў *апрычніну* (1565), фізічна знішчаў сваіх праціўнікаў, канфіскоўваў іх уладанні, караў смерцю і часта рэпрэсіраваў невінаватых. За дэспатычны характар празваны Грозным. Пры ім узмацнілася запрыгоньванне сялян. У час яго царавання далучаны *Казанское ханства* (1552), *Астраханское ханства* (1556), у залежнасць трапіла *Сібірское ханства* (1555, далучана ў 1581), Вял. Нагайская арда (1557). Прадаўжаў расшырэнне тэр. і цэнтралізацыю Рус. дзяржавы ў інтарэсах дваранства. За выхад у Балтыйскае м. вёў войны з Лівоніяй, Вял. кн. Літоўскім, Польшчай, Швецыяй (гл. *Лівонская вайна 1558—83*). Праз паўн. моры наладзіў гандл. сувязі з Англіяй, Галандыяй, Францыяй.

Літ.: Зимин А. А. Реформы Ивана Грозного, М., 1960; Полосин И. И. Социально-политическая история России XVI — начала XVII в., М., 1963; Дубровский С. М. Против идеализации деятельности Ивана IV, «Вопросы истории», 1956, № 8. *А. П. Грыцкевіч.* Мінск.

ІВА́Н V Алякса́ндравіч (27.8.1666—29.1.1696), рускі цар, сын *Аляксея Міхайлавіча* ад шлюбу з М. І. Міласлаўскай. Пасаджаны на трон у 1682 з братам Пятром і зацверджаны Земскім саборам як «першы» цар. Цараванне І. V было намінальнае: да 1689 фактычна кіравала *Соф'я Аляксееўна*, а пасля яе звяржэння — Пётр І.

ІВА́НАВА (Я н а в а), горад (з 1971), цэнтр Іванаўскага р-на Брэсцкай вобл., на р. Самаранка (бас. Прыпяці). За 132 *км* на У ад Брэста; чыг. ст. Янаў-Палескі на лініі Брэст — Пінск. Аўтобусная станцыя. 7,1 тыс. ж. (1971). Прамысл. прадпрыемствы: з-ды сухога абястлушчанага малака, кансервавы, хлебапякарны, камбінат быт. абслугоўвання, раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі, інкубатарна-птушкагадоўчая станцыя; будуецца (1972) з-д жалезабетонных вырабаў. 2 сярэднія і завочная школы, школа рабочай моладзі, дзіцячыя яслі-сад, Дом культуры, кінатэатр, 2 масавыя б-кі, бальніца. Помнік У. І. Леніну; помнік сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну. Мемарыяльны комплекс ахвярам фашызму.



Іванава. Плошча Кастрычніка.

У 1897 у І. было 2900 ж., мястэчка Кобрынскага пав. Гродзенскай губ. У 1921—39 у складзе бурж. Польшчы. У Айч. вайну І. акупавана (з чэрв. 1941 да 16.7.1944) і спалена ням.-фаш. захопнікамі, якія закатавалі больш за 5 тыс. сав. грамадзян.

ІВА́НАВА (да 1932 І в а н а в а - В а з н я с е н с к), горад, цэнтр Іванаўскай вобл. РСФСР, на р. Увадзь (прыток Клязьмы). Вузел чыгунак і аўтамаб. дарог. 419 тыс. ж. (1970). Меланжавы, баваўняны, камвольны камбінаты, 9 тэкст., 3 швейныя і шпулькавая ф-кі, швейны з-д, камбінат штучнай падэшвы, хімзавод. Прадпр. трыкатажнай, абутковай, харч. прамысловасці. Машынабудаванне (з-ды: тарфяных машын, тэкст. машынабудавання, механічны, аўтакранаў, расточных станкоў, часальных машын, выпрабавальных прылад). 2 ЦЭЦ. 6 ВНУ, ф-т Усесаюзнага завочнага юрыд. ін-та, 14 сярэдніх спец. навуч. устаноў. 3 тэатры, цырк, філармонія. Краязнаўчы музей.

Утвораны ў 1871 з в. Іванава (вядома з 16 ст.) і Вазнясенскага пасаду. Першыя палатняныя мануфактуры ў в. Іванава засн. ў сярэдзіне 18 ст. З канца 19 ст. цэнтр тэкст. прамысловасці і рэвалюц. руху. У 1892 арганізаваны першы рабочы марксісцкі гурток, у 1898 к-т РСДРП. У час стачкі 1905 у І. створаны адзін з першых Саветаў рабочых дэпутатаў — Савет упаўнаважаных. 25.10(7.11).1917 устаноўлена Сав. улада. З 1918 І.— цэнтр Іванава-Вазнясенскай губ.

Літ.: Город Иваново. Путеводитель, Ярославль, 1968.

ІВА́НАВА СЛАБАДА́, вёска ў Галіцкім с/с Клімавіцкага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр калгаса «Чырвоны сцяг». За 29 *км* на У ад Клімавіч, 153 *км* ад Магілёва, 22 *км* ад чыг. ст. Шасцёраўка. 144 ж., гасп. 45 (1971). Клуб, б-ка, магазін. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны.

ІВА́НАВА СЛАБАДА́, вёска ў Тонежскім с/с Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр калгаса «Чырвонае Палессе». За 52 *км* на ПнЗ ад Лельчыц, 267 *км* ад Гомеля, 55 *км* ад чыг. ст. Жыткавічы. 1062 ж., гасп. 271 (1971). Смалакурны з-д, лясніцтва, пякарня, швейная майстэрня. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, 3 магазіны. У снеж. 1941 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі.

ІВА́НАЎ Аляксандр Андрэевіч [16(28).7.1806, Пецярбург — 3(15).7.1858], рускі жывапісец. Вучыўся ў Пецярбургскай АМ (1817—28) у бацькі (А. І. Іванава) і А. Я. Ягорава. У 1830 пасланы за мяжу ўдасканальваць майстэрства, у 1831—58 жыў у Італіі. Творчая сталасць мастака відаць у першых карцінах, створаных па прынцыпах класіцызму («Прыям просіць у Ахілеса цела Гектара», 1824; «Апалон, Гіяцынт і Кіпарыс», 1831—34; «Яўленне Хрыста перад Марыяй Магдалінай», 1835). У 1837—57 працаваў над вял. палатном «Яўленне Хрыста перад народам». Тэма твора — парыў народа насустрач духоўнаму вызваленню. Як падрыхтоўчыя работы для гэтай карціны напісаў многа пейзажаў з натуры («Алівы ў Альбана» і інш.). Сац. глыбіні і канкрэтнасці псіхал. аналізу дасягнуў у партрэтных эцюдах (галовы Іаана Хрысціцеля, раба, хлопчыка), якія распрацоўвалі цэнтр. вобразы карціны і маюць самастойную высокую маст. вартасць. У канцы 30—40-х г. стварыў шэраг акварэляў — рэаліст. сцэнак з італьян. жыцця («Жанік выбірае пярсцёнак для нявесты»), пейзажаў («Галінка» і інш.). Для роспісаў задуманага ім грамадскага будынка І. стварыў «Біблейскія эскізы» (40-я г.), у якіх майстэрства мастака ўзнялося на больш высокую ступень. На радзіму вярнуўся ў 1858. Гуманістычны змест створаных ім вобразаў, спробы па-філасофску асэнсаваць сутнасць гістар. працэсаў, наватарскі характар маст. метаду — галоўныя рысы творчасці І., якая стала вяршыняй развіцця рус. жывапісу 1-й пал. 19 ст. Іл. гл. на ўкл. II да арт. *Графіка*.



Літ.: Алпатов М. В. Александр Андреевич Иванов. Жизнь и творчество, т. 1—2, М., 1956; Ракова М. М., А. Иванов, М., 1960 (бібліягр.).

ІВА́НАЎ Сцяпан, беларускі і рускі майстар мастацкай керамікі 17 ст. Гл. *Палубес* С. І.

ІВА́НАЎ Сяргей Васілевіч [4(16).6.1864, г. Руза Маскоўскай губ.— 3(16).8.1910], рускі жывапісец і графік. Вучыўся ў Маск. вучылішчы жывапісу, ваяння і дойлідства (1878—1882, 1884—85), Пецярбургскай АМ (1882—84). Акадэмік (1905). Чл. Т-ва перасоўных выставак (з 1899) і Саюза рус. мастакоў (з 1903). Стварыў рэаліст. карціны на тэмы жыцця рус. сялянства пераформеннага перыяду («На новыя месцы. Русь ідзе», 1886; «У дарозе. Смерць пераселенца», 1889; і інш.), на тэмы рэвалюц. падзей 1905—07 («Расстрэл», «1905 год. Сход», абедзве 1905) і на гістар. сюжэты («Прыезд іншаземцаў у Маскву 17 ст.», 1901; «Паход масквіцян», 1903; і інш.). У Дзярж. маст. музеі БССР — эскіз да карціны «На новыя месцы. Русь ідзе», «Аўтапартрэт» (1892—93) і некалькі эцюдаў.



Літ.: Грановский И. Н., С. В. Иванов, М., 1962.

ІВА́НАЎ Усевалад Вячаслававіч [12(24).2.1895, нас. Лябяжае Паўладарскага пав. Сяміпалацінскай вобл.— 15.8.1963], рускі савецкі пісьменнік. З сям'і настаўніка. Пачаў друкавацца ў 1915. На пачатку літ. дзейнасці меў падтрымку ад М. Горкага. У зб. «Сопкі. Партызанскія аповесці» (1923) адлюстраваны падзеі грамадз. вайны. П'есы «Браняпоезд 14-69» (1927, аднайменная аповесць 1922), «Блакада» (1929), аповесці «Хабу» (1925), «Гібель Жалезнай» (1928) паказваюць камуніст. партыю як гал. сілу рэвалюцыі і будаўніцтва сацыялізма. Аўтар аўтабіягр. раманаў «Прыгоды факіра» (1934—35), «Мы ідзём у Індыю» (1960), гісторыка-рэвалюц. рамана «Пархоменка» (1938—39), зб. апавяданняў і нарысаў «На Барадзінскім полі» (1944), рамана «Пры ўзяцці Берліна» (1946), кн. ўспамінаў «Сустрэчы з Максімам Горкім» (1947), п'есы «Ламаносаў» (1953). Т-р імя Я. Купалы паставіў «Браняпоезд 14-69» (1928) і «Блакаду» (1967). Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.



Тв.: Собр. соч., т. 1—8, М., 1958—60; Избр. произв., т. 1—2, М., 1968; бел. пер.— Браняпоезд 14-69. Аповесць, 2 выд., Мн., 1936.

Літ.: Всеволод Иванов — писатель и человек, М., 1970. *У. С. Карабан.* Мінск.

ІВА́НАЎКА, вёска ў Цялушскім с/с Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр калгаса імя Някрасава. За 20 *км* на ПдУ ад Бабруйска, 130 *км* ад Магілёва, 6 *км* ад чыг. раз'езда Савічы. 511 ж., дварoў 151 (1971). Пач. школа, клуб, фельч.-ак. пункт, адд. сувязі, магазін.

ІВА́НАЎКА, вёска ў Недайскім с/с Буда-Кашалёўскага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр калгаса імя Гагарына. За 15 *км* на ПдЗ ад

Буда-Кашалёва, 53 *км* ад Гомеля. 340 ж., гасп. 106 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў Айч. вайны.

ІВА́НАЎКА, вёска ў Лабковіцкім с/с Крычаўскага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр калгаса «Ленінскі заклік». За 7,5 *км* на Пн ад Крычава, 111 *км* ад Магілёва, 2 *км* ад чыг. ст. Крычаў 1-ы. 580 ж., гасп. 169 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка.

ІВА́НАЎСКАЯ ВО́БЛАСЦЬ, у складзе РСФСР. Утворана 14.1.1929. Размешчана ў цэнтры Еўрап. ч. СССР, у міжрэчча Волгі і Клязьмы. Пл. 23,9 тыс. км². Нас. 1338 тыс. чал. (1970). Падзяляецца на 19 раёнаў; 17 гарадоў, 29 гар. пасёлкаў. Цэнтр г. Іванава.



Паверхня — хвалістая раўніна, парэзаная левымі прытокамі Клязьмы, на ПнЗ града марэнных узвышшаў выш. 196 *м*. Карысныя выкапні: торф, фасфарыты, мінер. буд. матэрыялы. Клімат умерана кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. −12, ліп. 18—19 °С. Ападкаў 600 *мм* на З, 550 *мм* на У за год. Гал. рака Волга (у межах вобласці частка Горкаўскага вадасх.). Левыя прытокі Клязьмы: Лух, Цеза, Увадзь, Нерль. Многа поймавых, ледавіковых, карставых азёраў. Глебы пераважна дзярнова-падзолістыя і балотныя, у абалонах рэк алювіяльныя. 43% тэр. занята лесам (пераважна хвойныя пароды). Асн. насельніцтва рускія. Сярэдняя шчыльнасць 56 чал. на 1 км². Гарадскога нас. 75% (1970). Найб. гарады: Іванава, Кінешма, Шуя, Вічуга.

Аб'ём валавой прадукцыі ўсёй прамысл. ў 1970 павялічыўся ў параўнанні з 1940 амаль у 4 разы. Асн. галіна прамысл. тэкстыльная. Вобласць дае каля 30% баваўняных і штапельных тканін у краіне. Асн. цэнтры тэкст. прамысл. Іванава, Кінешма, Шуя, Вічуга, Фурманаў, Цейкава, Раднікі, Южа, Кохма. Найб. значныя прадпр. меланжавы, баваўняны і камвольны камбінаты, камбінат штучнай падэшвы, шпулькавая ф-ка і інш. Ільняная прамысл. (узорыстыя і рознакаляровыя вырабы Якаўлеўскага льнокамбіната). Машынабудаванне і металаапрацоўка: з-ды тэкст. маш.-буд., тарфяных машын, механічных, аўтакранаў, расточных станкоў, часальных машын у Іванаве, з-д папераробных машын у Кінешме, з-д «Строммашына» і эмаліраванага посуду ў Кохме, машынабудаўнічы ў Шуі, ліцейна-механічны ў Фурманаве. Хім. прамысл. вырабляе тэхн. спірт, фарбы, кіслоты для тэкст. прамысл., хім. валокны. Лясная, лесахімічная і дрэваапр. прамысловасць. Прадпрыемствы трыкатажнай, швейнай, абутковай і харч. прамысловасці. Шырока вядомыя маст. промыслы ў г. п. Палех і Холуй. Энерг. база прамысл.— торф, на ім працуюць ІвДРЭС (недалёка ад Іванава) і 2 ЦЭЦ у Іванаве. На 1.1.1971 у І. в. 159 калгасаў і 83 саўгасы. Пасяўная пл. ў 1970 (тыс. *га*) 578, з іх пад збожжавымі 286,6, кармавымі 215,8, бульбай і агародніна 61,9, тэхнічнымі (лён-даўгунец) 13,7. Жывёлагадоўля малочна-мяснога кірунку. На пач. 1971 было (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 333,4 (у т. л. кароў 151,6), свіней 165,6, авечак і коз 212,6. Даўж. чыгунак 334 *км* (1971). Аўтамаб. дарог 7 тыс. *км*, у т. л. з цвёрдым пакрыццём 2 тыс. *км*. Суднаходства па Волзе, Клязьме і інш. рэках. Ін-ты: энергетычны, хім.-тэхнал., с.-г., тэкст., мед., 2 педагагічныя; ф-т Усесаюзнага юрыдычнага завочнага ін-та; 30 сярэдніх спец. навуч. устаноў. 4 тэатры, філармонія, 8 музеяў. Абл. газ. «Рабочий край».

В. П. Варанцова. Мінск.

ІВА́НАЎСКІ РАЁН, у складзе Брэсцкай вобл. Утвораны 15.1.1940. На Пд вобласці, каля граніцы з УССР. Пл. 1,5 тыс. км². Нас. 61,9 тыс. чал. (1971). Падзяляецца на 16 сельсаветаў. Цэнтр г. Іванава.

Рэльеф нізінна-раўнінны. Пн і Пд заняты зах. ускраінай плоскай нізіны Прыпяцкага Палесся (выш. 140—150 *м* над узр. м.), на аднастайным фоне якой выдзяляюцца прыўзнятыя грывы, перамежаваныя забалочанымі нізінамі. Цэнтр. частку займае платопадобная водналедавіковая раўніна *Загароддзе*. Карысныя выкапні: 6 радовішчаў цагельнай сыравіны — 1,3 млн. м³ (у т. л. ў Залугах — 0,45 млн. м³ і Скарацічах — 0,37 млн. м³), радовішча буд. пяску Баравіца (0,4 млн. м³). Сярэдняя т-ра студз. ад −5 да −5,5 °С, ліп. ад 18,5 да 19 °С. Ападкаў 564 *мм* за год. Вегет. перыяд 202 дні. Рэкі Ясельда з прытокам Струга на Пн, *Дняпроўска-Бугскі канал* на Пд, у яго ўпадаюць Няслуха і Пілінаўка. Азёры Пясчанае, Скорань, Завішчанскае, Мотальскае і інш. Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (9,8%), дзярнова-падзолістыя забалачальныя (48,5%), дзярнова-балотныя (20,9%), тарфяна-балотныя (20,8%). З мінер. глебаў 66,7% супясчаных, 33,3% пясчаных. Якасная ацэнка глебаў у балах: ворных зямель 42 (цана бала 0,30 ц/га збожжа), кармавых угоддзяў 27, усіх с.-г. угоддзяў 36. Пад лесам 23,4% тэр., асн. лясныя масівы на ПдУ раёна. Каля ⅔ пл. лесу пад хвойнымі (хвоя, елка); з драбналістых бяроза, вольха, асіна; трапляюцца дуб, граб, ясень. Насяляюць раён беларусы (97,3%), ёсць рускія, украінцы, палякі і інш. Сярэдняя шчыльн. 41,3 чал. на 1 км². Гарадскога нас. 11,5%.

Прамысл. прадпрыемствы: з-ды сухога абястлушчанага малака, кансервавы, хлебапякарны, інкубатарна-птушкагадоўчая станцыя, камбінат быт. абслугоўвання, раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі (Іванава), спіртзавод (Бродніца), цагельны з-д «Замошша», Агдэмерскае спецыялізаванае аддз. Сельгастэхнікі. Будуюцца (1972) з-д жалезабетонных вырабаў у Іванаве і цагельны з-д «Моладава». У раёне 22 калгасы і саўгас (1971).



Вуліца ў вёсцы Дастоева.





На Мотальскім возеры.

Калгасы і іх цэнтры: «Бальшавік» (*Дружылавічы*), «Беларусь» (*Гнеўчыцы*), імя М. Горкага (*Ляскавічы*), «XXII партз'езд» (*Тышкавічы*), «Дружба» (*Сачыўкі*), «За мір» (*Псышчава*), «Зара камунізма» (*Лечкавічы*), «Кастрычнік» (*Адрыжын*), імя Крупскай (*Варацэвічы*), імя Леніна (*Махро*), «Маладая гвардыя» (*Снітава*), «Моладава» (*Моладава*), «Перамога» (*Опаль*), «Прагрэс» (*Глінна*), «Праца» (*Гарбаха*), «Расіл» (*Крытышын*), «Савецкі» (*Скарацічы*), «Светлы шлях» (*Рудск*), «40 гадоў Кастрычніка» (*Моталь*), «Чырвоная зорка» (*Дастоева*), «Шлях да камунізма» (*Стральна*), «Шлях Леніна» (*Ляхавічы*). Саўгас «Бродніцкі» (*Бродніца*).

С. гасп. спецыялізуецца на мяса-малочнай жывёлагадоўлі, ільнаводстве і буракаводстве; вырошчваюць збожжа і бульбу. Пад с.-г. ўгоддзямі каля 55% тэр. На пач. 1971 асушана 25,2 тыс. *га* балот і забалочаных зямель, у т. л. 10,9 тыс. *га* тарфянікаў. Агульная пасяўная плошча (тыс. *га*, 1970) 47,2, у т. л. пад збожжавымі і зернебабовымі 19,1, тэхнічнымі 3,7, бульбай 9,6, кармавымі культурамі 14,4. На пач. 1971 было (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 47,5 (у т. л. кароў 23,1), свіней 26,9, авечак 4,5. Па тэр. раёна праходзяць чыгунка і аўтамаб. дарога Брэст — Пінск. Вял. значэнне мае Дняпроўска-Бугскі канал.

У 1971 у раёне было 18 сярэдніх, 31 васьмігадовая, 37 пач. школ, завочная сярэдняя і школа рабочай моладзі, 6 дашкольных устаноў, 41 клубная ўстанова, 62 масавыя б-кі, 51 кінаўстаноўка, у т. л. 33 стацыянарныя, 7 бальніц, 24 фельч.-ак. пункты, 3 урачэбна-амбулаторныя ўчасткі. У 1970 у раёне працавала 494 спецыялісты з вышэйшай адукацыяй, у т. л. 39 інжынераў, 18 аграномаў, 27 заатэхнікаў і вет. урачоў, 336 настаўнікаў, 47 урачоў; 975 спецыялістаў з сярэдняй спец. адукацыяй. Раённая газ. «Чырвоная звязда».

А. М. Крайчук. Брэст.

ІВА́НА-ФРАНКО́ЎСК (да 1962 Станіслаў), горад, цэнтр Івана-Франкоўскай вобл. УССР. Чыг. станцыя, аэрапорт. 105 тыс. ж. (1970). Найб. развіта прыладабудаванне, лёгкая, харч., дрэваапр. прамысловасць. З-ды: прыладабудавання, аўтарамонтны, шынарамонтны, хімічны. Гарбарна-абутковы, спіртагарэлачны, мэблевы, мясны камбінаты. Швейная, мэблевая, трыкатажная ф-кі. Ін-ты: нафты і газу, пед., медыцынскі. 4 сярэднія спец. навуч. ўстановы. Драм. і лялечны тэатры, філармонія. Краязнаўчы музей.

Засн. ў 1662. З 1772 пад уладай Аўстрыі. У 1866 пабудавана чыг. ст. У 60—70-я г. 19 ст. ў горадзе

ўзніклі першыя рабочыя арг-цыі. З ліст. 1918, пасля распаду Аўстра-Венгрыі, у складзе бурж.-нацыяналіст. т. зв. Заходнеўкраінскай народнай рэспублікі. У лют. 1919 тут па нелегальнай канферэнцыі было арганізацыйна аформлена стварэнне Кампартыі Усх. Галіччыны. У ліп. 1919 акупаваны войскамі бурж. Польшчы. У вер. 1939 вызвалены Чырв. Арміяй. З снеж. 1939 цэнтр вобласці УССР. У Айч. вайну акупаваны ням.-фаш. захопнікамі (1941 — 27.7.1944). Перайменаваны ў 1962 на ўшанаванне памяці ўкр. пісьменніка Івана Франка.

ІВА́НА-ФРАНКО́ЎСКАЯ ВО́БЛАСЦЬ (да 1962 Станіслаўская), на З УССР. Утворана 4.12.1939. Пл. 13,9 тыс. *км*². Нас. 1250 тыс. чал. (1970). Падзяляецца на 14 раёнаў; 13 гарадоў, 26 гар. пас. Цэнтр г. Івана-Франкоўск.

Паводле характару рэльефу выдзяляюцца 3 ч.: паўн.-ўсх.— раўнінная (Прыднястроўе), сярэдняя — перадгорная (Прыкарпацце) і паўд.-зах.— горная (паўн.-ўсх. схілы Усходніх Карпат), дзе найвыш. пункт вобласці г. Сывуля — 1818 *м*. Карысныя выкапні: нафта, газ, калійная і спажывецкая солі, азакерыт, буры вугаль, буд. матэрыялы. Мінер. крыніцы. Клімат умераны кантынентальны. У Прыднястроўі і Прыкарпацці сярэдняя т-ра студз. —5,1, ліп. 18,8 °С, ападкаў 500—800 *мм* за год; у Карпатах сярэдняя т-ра студз. —6,4, ліп. 16 °С, ападкаў 800—1100 *мм* за год. Гал. рака Днестр з прытокамі Свіча, Ломніца, Луква, Быстрыца, Свірж і інш. На Пд верхняе цячэнні Прута. У Прыднястроўі глебы ападзоленыя чарназёмы і шэрыя; у Прыкарпацці дзярнова-падзолістыя, у далінах рэк дзярновыя глеевыя і балотна-лугавыя; у Карпатах да выш. 1200 *м* бурыя лясныя, да 1600 *м* горна-падзолістыя, вышэй за 1600 *м* горна-лугавыя. Пад лесам 41,3% тэр. Гал. пароды: бук, дуб, граб, хвойныя. Асн. насельніцтва ўкраінцы. Жывуць рускія, палякі і інш. Сярэдняя шчыльн. 89,9 чал. на 1 км². Гарадскога нас. 31% (1970). Найб. гарады: Івана-Франкоўск, Каламыя, Калуш.


ІВАНА-ФРАНКОЎСКАЯ ВОБЛАСЦЬ
Маштаб 1:2 000 000
20 0 20 40 км
25°ус.д.
ЗАКАРПАЦКАЯ ВОБЛ.
ЧАРНАВІЦКАЯ ВОБЛ.
Івана-Франкоўская вобл.
Стрый
Калуш
Галіч
Каламыя
Косаў
Вяршкоў
Сыгет
Рахаў
Тячаў
Хуст
Мукачава
Ужгарод
Перацін
Берэзаны
Казлоў
Заляшчыкі
Тлумач
Грушава
Чарнілаўцы
Снятын
Вашкаўцы
Рожнаў
Ямніца
Рошнеў
Пабаражжа
Бучач
Заставы
Патокі
Тысменіца
Белагорка
Ланчын
Гарадзенка
Чарнацін
Гвазджэц
Ганькоўцы
Тудзюкоў
Усце
Завалатаў
Пнятын
Ямніцкі
Пасечны
Ярэмча
Пістынь
Ланская Слабодка
Вінаграды
Надворная
Бітка
Асмалода
Салотвін
Атыня
Грабаўцы
Багарадчаны
Выгада
Брошнеў-Асада
Івана-Франкоўск
Красная
Пярэхрэсце
Сухадол
Вышаў
Дашава
Журавна
Моршын
Вал. Тураў
Тамашоўцы
Ваймілаў
Жорнічэнь
Манастырыска
Заставна
Ланчын
Ланчынскі
Ланчынскі
Ланчынскі

З 1948 у АН БССР, з 1969 заг. аддзела дрэўных раслін Ін-та эксперым. батанікі АН БССР. Навук. працы па біялогіі і інтрадукцыі дрэўных раслін у БССР. Вывучае іх фізіялогію і рост у залежнасці ад кіслотнасці глебы, уплыву ўгнаенняў і інш. фактараў асяроддзя. Адзін са складальнікаў працы «Інтрадукцыраваныя дрэвы і хмызнякі ў Беларускай ССР» (в. 1—3, 1959—61). Узнаг. ордэнам Чырв. Зоркі, медалямі.

Тв.: (Разам з А. У. Панамаровай і Т. Ф. Дзяругінай) Отношение древесных растений к влажности и кислотности почвы, Мн., 1966; Рост древесных растений и кислотность почв, Мн., 1970.

ІВАНОЎ Аркадзь Пятровіч (н. 29.12.1929, Самара), беларускі савецкі фізік. Д-р фіз.-матэм. н. (1967), праф. (1970). Скончыў Ленінградскі ін-т дакладнай механікі і оптыкі (1953), працаваў у Дзярж. аптычным ін-це (Ленінград). З 1959 у Ін-це фізікі АН БССР, заг. лабараторыі оптыкі рассейвальных асяроддзяў (з 1964). Навук. працы па распаўсюджанні светлавога выпрамянення вялікай шчыльнасці ў неаднародных (святлорассейвальных) асяроддзях, у прыватнасці ў паветраных і марскіх басейнах. Паказаў (1958) на магчымасць выкарыстання растворaў складаных малекул у якасці сістэм, здольных узмацняць святло. Распрацоўвае метады вывучэння аптычных уласцівасцей акіянскіх водаў і воблачных утварэнняў з дапамогай лазераў.

Тв.: Оптика рассеивающих сред, Мн., 1969.

ІВАНОЎ Барыс Канстанцінавіч [н. 24.8(6.9). 1905, в. Заклінне Лужскага пав. Пецярбургскай губ.], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Віцебскай вобл. ў Айч. вайну. З служачых. Чл. КПСС з 1928. З 1928 на камсамольскай і пед. рабоце ў Ленінградскай вобл. У партызанах з 25.4.1942 — камандзір групы, камісар атрада; з чэрв. 1943 камісар *партызанскай брыгады 1-й імя К. С. Заслонава* Віцебскай вобл., у крас.—ліп. 1944 адначасова і камандзір брыгады. З 1944 на пед. і сав. рабоце. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Чырв. Сцяга, медалямі. Жыве ў Ноўгарадзе.

ІВАНОЎ Васіль Зіноўевіч (1.1.1898, в. Цітаўка Бійскай акругі Томскай губ.— 13.4.1946), адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Баранавіцкай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1927. Скончыў юрыдычныя курсы (1927). З 1919 у Чырв. Арміі. У 1920—22 настаўнічаў, у 1922—26 на сав. рабоце. З 1927 нар. суддзя, нач. міліцыі, заг. аддзела райкома ВКП(б). У партызанах з мая 1943 — камандзір атрада, з кастр. 1943 камандзір *партызанскай брыгады № 20* імя В. С. Грызадубавай Баранавіцкай вобл. Пасля вайны старшыня райвыканкома, пазней першы сакратар Быценскага райкома КП(б)Б Баранавіцкай вобл.

ІВАНОЎ Ермалай Аляксеевіч [н. 14(27).6. 1912, в. Падпаяскі Веліжскага пав. Віцебскай губ.], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Мінскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1939. З 1932 на гасп. рабоце. У Чырв. Арміі з 1940. У партызанах з жн. 1942 — камандзір аддзялення, нач. штаба; з 10.4.1943 камісар, з 20.10.1943 камандзір *партызанскай брыгады 1-й Мінскай* Мінскай вобл. Пасля вайны гал. інжынер, кіраўнік трэста, нам. міністра лясной прамысловасці Карэла-Фінскай ССР, нач. камбіната «Пудажлес», засл. працаўнік лясной прамысл. Карэльскай АССР. Узнаг. 4 ордэнамі, медалямі. Жыве ў г. Пудажы Карэльскай АССР.

ІВАНОЎ Іван Аксенцьевіч (н. 25.11.1910, Відзы Ковенскай губ.), адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Вілейскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1935. За рэвалюц. дзейнасць у Зах. Беларусі польскімі ўладамі асуджаны ў турму. У 1939—41 на сав. рабоце ў Відзах. У партызанах з чэрв. 1942 — камандзір групы, узвода, камісар атрада; з вер. 1943 камандзір *партызанскай брыгады імя Л. М. Даватара* Вілейскай вобл. Пасля вайны на сав. і гасп. рабоце. Узнаг. ордэнам Чырв. Сцяга, медалямі. Жыве ў Вільнюсе.

ІВАНОЎ Іван Іванавіч [28.1(9.2).1897, в. Трупехіна Старарускага пав. Ноўгарадскай губ.— 8.7.1968], удзельнік грамадзянскай вайны і баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). Чл. КПСС з 1925. У Чырв. гвардыі з снеж. 1917, у Чырв. Арміі з 1918. Вызначыўся ў Лоеўскім р-не Гомельскай вобл. 15.10.1943 стралковы корпус пад камандаваннем ген.-м. І. фарсіраваў Дняпро каля в. Шчытцы, захапіў плацдарм і прычыніў ворагу вял. страты.

ІВАНОЎ Іван Мартынавіч [н. 6(19).7.1911, в. Карчомка Магілёўскага пав.], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Магілёўскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1939. Скончыў Вышэйшую парт. школу пры ЦК КПСС (1957). З 1933 у Чырв. Арміі, з 1935 на сав. і парт. рабоце ў Магілёўскім р-не. На пачатку Вял. Айч. вайны ў нар. апалчэнні, удзельнічаў у абароне Магілёва. У партызанах з чэрв. 1942 — камісар атрада; з ліст. 1943 камісар *партызанскага палка 121-га* імя А. Касаева Магілёўскай вобл. Пасля вайны на парт. і гасп. рабоце ў Магілёўскай вобл. Узнаг. ордэнам Чырв. Сцяга, медалямі. Жыве ў Магілёве.

ІВАНОЎ Ігар Сяргеевіч (н. 8.6.1920, г. Верхнеудзінск Забайкальскай вобл.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). Чл. КПСС з 1944. У Чырв. Арміі з 1939. Вызначыўся ў баях за вызваленне Гомельскай і Палескай абл. На чале аддзялення разведчыкаў пераправіўся цераз Дняпро і 7—15.10.1943 вёў разведку ў тыле ворага. 23.10.1943 у баі за в. Чырвоны Рог узняў на рукапашную контратаку байцоў трох напаўакружаных батарэй, з адбітай у гітлераўцаў гарматы адкрыў агонь па ворагу. Жыве ў Ленінградзе.

ІВАНОЎ Ілья Іванавіч [1800, г. Гродна — 26.12.1838 (7.1.1839)], дзекабрыст. З сям'і паштовага служачага. Служыў у штабе 3-га пяхотнага корпуса (Жытомір). Чл. Таварыства з'яднаных славян (з пач. 1825), яго сакратар. Прыхільнік звяржэння самадзяржаўя, устанаўлення рэсп. ладу і ліквідацыі прыгону ў Расіі. Прытрымліваўся атэіст. поглядаў. Пасля аб'яднання Т-ва з'яднаных славян з Паўд. т-вам дзекабрыстаў (восень 1825) разам з братамі А. І. і П. І. *Барысавымі*, І. І. *Гарбачэўскім*, П. Ф. Грамніцкім браў удзел у падрыхтоўцы ўзбр. паўстання ваен. часцей на Валыні для падтрымкі паўстання Чарнігаўскага палка. Арыштаваны і засуджаны на 12 гадоў катаргі. З 1832 на пасяленні ў Іркуцкай губ., дзе і памёр.

Літ.: Восстание декабристов. Материалы, т. 5, М.— Л., 1926; Горбачевский И. И. Записки. Письма, М., 1963; Нечкина М. В. Общество соединенных славян, М.— Л., 1927.

А. В. Вараб'ёў. Мінск.

ІВАНОЎ Канстанцін Васілевіч [15(27).5.1890, в. Слакбаш Белебееўскага пав. Уфімскай губ.— 13(26).3.1915], чувашскі паэт, адзін з заснавальнікаў чуваш. л-ры. З сялян. Настаўнічаў у Сімбірску. Літ. дзейнасць пачаў перакладам рус. рэвалюц. песень і твораў рус. паэтаў (1907). Аўтар казкі ў вершах «Дзве дачкі», балады «Жалезная мялка», трагедыі ў вершах «Раб д'ябла» і інш. Найлепшы твор І.— ліра-эпічная паэма «Нарспі» (1908) пра трагічны лёс чуваш. жанчыны. Пафас яе — у сцвярджэнні права прац. чалавека быць гаспадаром жыцця. Творам І. ўласцівыя народнасць, дэмакратызм, пратэст супраць сац. і нац. прыгнёту.

Тв.: Собр. соч., Чебоксары, 1957.

Літ.: Сироткин М. Я., К. В. Иванов, Чебоксары, 1955; Классик чувашской поэзии, Чебоксары, 1966.

ІВАНОЎ Мікалай Васілевіч (н. 9.5.1923, в. Юркава Сычоўскага пав. Смаленскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1944. На фронце з 1942, лётчык-штурмавік. Удзельнік разгрому ворага пад Бабруйскам, Баранавічамі, Слонімам, Брэстам. Зрабіў 371 баявы вылет. Знішчыў 15 танкаў, 2 эшалоны, 8 артыл. батарэй, 62 аўтамашыны, 2 склады. Жыве ў Белай Царкве Кіеўскай вобл.

ІВАНОЎ Міхаіл Фёдаравіч [20.9(2.10).1871, Ялта — 29.10.1935], савецкі вучоны ў галіне жывёлагадоўлі. Акад. УАСГНІЛ (1935). У 1897 скончыў Харкаўскі вет. ін-т. З 1900 выкладчык, з 1906 праф. кафедры жывёлагадоўлі гэтага ін-та. З 1914 праф. Маск. с.-г. ін-та (з 1923 Маск. с.-г. акадэмія імя Ціміразева). У 1925 арганізаваў у Асканіі-Нова заатэхнічную доследную і племянную станцыю. Асн. працы па племянной справе, селекцыі і акліматызацыі жывёл. Распрацаваў і ўдасканаліў метады развядзення с.-г. жывёл. Вывеў новыя пароды — украінскую стэпавую белую свінню, *асканійскую* пароду авечак і інш. Імя І. прысвоена Усесаюзнаму НДІ гібрыдызацыі і акліматызацыі жывёл (з 1956 Украінскі НДІ жывёлагадоўлі стэпавых раёнаў імя М. Ф. Іванова «Асканія-Нова»).

Тв.: Полн. собр. соч., т. 1—7, М., 1963—65.

Літ.: Елагин В. Д. Цель жизни. Повесть о жизни академика М. Ф. Иванова, М., 1961.

ІВАНОЎ Павел Іванавіч [н. 29.6(12.7).1909, Саратаў], беларускі савецкі акцёр. Засл. арт. БССР (1940). Скончыў Ленінградскі тэатр. тэхнікум (1928). З 1929 акцёр т-ра імя Я. Коласа, з 1945 у т-ры імя Я. Купалы. У 1964—69 рэж. Нар. т-ра Мінскага аўтамаб. з-да. Характарны, камедыйны акцёр. З роляў: Гайдай («Гібель эскадры» А. Карнейчука), фон Штубэ («Разлом» Б. Лаўранёва), Сарокін («Павел Грэкаў» Б. Войцехава і Л. Ленча), Міша Бодрыя («Горад вятроў» У. Кіршона), Гуліяшвілі («Хлопец з нашага горада» К. Сіманава), Шаранговіч («Над Бярозай-ракой» П. Глебкі) у т-ры імя Я. Коласа; Джэралд («Ён прыйшоў» Дж. Прыстлі), Аўчарэнка («Крылле» Карнейчука), Нейгаўз, Сурмач («Канстанцін Заслонаў», «У ціхім завулку» А. Маўзона), Печкуроў («Выбачайце, калі ласка!» А. Макаёнка) у т-ры імя Я. Купалы.

ІВАНОЎ Сямён Варфаламеевіч [15(27).4. 1880, в. Мамкіна Ельнінскага пав. Смаленскай губ.— 8.6.1955], савецкі дзярж. дзеяч. З сялян. Чл. КПСС з 1904. За рэвалюц. дзейнасць засуджаны (1907) на 15 гадоў катаржнай турмы, адкуль вызвалены Лют. рэвалюцыяй. Удзельнік падрыхтоўкі і правядзення Кастр. рэвалюцыі ў Смаленскай губ. На І з'ездзе КП(б)Б выбраны чл. ЦБ. Увайшоў у склад Часовага рабоча-сялянскага ўрада Сав. Беларусі (камісар унутр. спраў) і разам з інш. 4 членамі ўрада падпісаў Маніфест пра абвяшчэнне БССР (1.1.1919). Пасля ўтварэння Літ.-Бел. ССР чл. ЦК і Прэзідыума ЦК КП(б) Літвы і Беларусі. З жн. 1919 на парт. рабоце ў Смаленску. Пасля на сав. і гасп. рабоце. Чл. ЦВК БССР і ЦВК Літ.-Бел. ССР (1919). Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.

ІВАНОЎ Сяргей Мікалаевіч (н. 25.9.1920, Харкаў), адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Мінскай і Беластоцкай абл. у Айч. вайну. З служачых. Чл. КПСС з 1947. Скончыў ваеннае вучылішча (1941), Мінскі пед. ін-т імя М. Горкага (1968). З 1938 у Чырв. Арміі. У партызанах з студз. 1942 — камандзір групы, атрада; з вер. 1942 да 25.6.1943 камандзір *партызанскай брыгады 2-й Мінскай*; з 11.11. 1943 — *партызанскай брыгады імя П. К. Панамарэнкі* Беластоцкай вобл. Пасля вайны на сав. і гасп. рабоце. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Чырв. Сцяга, медалямі. Жыве ў Рудзенску.

ІВАНОЎ Сяргей Несцеравіч [н. 7(20).3.1909, в. Валынцава Горацкага пав. Магілёўскай губ.], беларускі савецкі вучоны ў галіне глебазнаўства. Чл.-кар. АН БССР (1961). Д-р с.-г. н. (1958), праф. (1959). Чл. КПСС з 1942. Скончыў Бел. с.-г. акадэмію (1931). Удзельнік Вял. Айч. вайны. Дырэктар Ін-та сацыяліст. с. гасп. АН БССР (1938—41). Заг. лабараторыі фізіка-хіміі глебаў (з 1945), фізіка-хіміі глебаў і радыеактыўных ізатопаў (з 1955) Бел. НДІ глебазнаўства і аграхіміі, дырэктар гэтага ін-та (1962—69). Вывучаў фасфатны рэжым глебаў, абменныя рэакцыі; выявіў прыроду сувязі паглынутых фасфатыонаў у глебах. Выкарыстоўваючы радыеактыўныя ізатопы, устанавіў матэм. залежнасць паміж колькасцю фосфару, кальцыю і калію ў рас-



ліне, якія паступілі з угнаення, і колькасцю іх у глебе. Распрацаваў новы біял. прынцып вызначэння патрэбы раслін ва ўгнаеннях у залежнасці ад колькасці пажыўных рэчываў у глебах. Даследуе рэжым жыўлення раслін. Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі.

Тв.: Обменная способность почв в зависимости от реакции среды, рода и концентрации катионов, Мн., 1938; Физико-химический режим фосфатов торфов и дерново-подзолистых почв, Мн., 1962; (разам з Шыдлоўскім С. Ф. і Кругловым Л. В.) Применение рубидия-86 как метки для калия при изучении калийного питания растений, «Доклады АН БССР», 1969, т. 13, № 10.

Літ.: С. Н. Иванов, «Почвоведение», 1969, № 12.

ІВАНОЎ Фёдар Мікалаевіч (н. 20.9.1929, в. Гірсаўка Бярдзянскага р-на Марыупальскай акругі), рускі савецкі акцёр. Засл. арт. БССР (1968). Чл. КПСС з 1962. Пасля заканчэння Бел. тэатр.-маст. ін-та (1954, педагог К. Саннікаў) працуе ў Гомельскім т-ры. Выканаўца характарных, камед. роляў. Сярод іх: Сахатых («Угрум-рака» паводле В. Шышкова), Пікалаў («Любоў Яравая» К. Транёва), Пярчыхін («Мяшчане» М. Горкага); у бел. рэпертуары — Майбарада, Дымар («Глыбокая плынь», «Сэрца на далоні» паводле І. Шамякіна), Аляксей («Пад адным небам» А. Маўзона), Цімох («Рудабельская рэспубліка» паводле С. Грахоўскага).

ІВАНОЎ Эраст Іванавіч (н. 8.1.1931, Масква), наватар вытворчасці, лаўрэат Дзярж. прэміі СССР (1968). Чл. КПСС з 1963. Скончыў Маскоўскі аўтамех. ін-т (1953). У 1953—60 канструктар на Мінскім аўтазаводзе, з 1960 нач. канструктарскага бюро ў аддзеле гал. канструктара Бел. аўтазавода. Дзярж. прэмія СССР прысуджана за ўдзел у стварэнні уніфікаваных вялікагрузных аўтамабіляў для адкрытых распрацовак карысных выкапняў і буд-ва і ў асваенні іх серыйнай вытворчасці.

ІВАНОЎ Яніс Андрэевіч [н. 26.9(9.10).1906, Прэйлі Дзвінскага пав. Віцебскай губ.], латышскі савецкі кампазітар. Нар. арт. СССР (1965). Скончыў Латвійскую кансерваторыю (1933), выкладае ў ёй (праф. з 1955). Найб. вядомы лат. сімфаніст. Аўтар 13 сімф. (за 6-ю, «Латгальскую», Дзярж. прэмія СССР 1950), фп., віяланчэльнага і скрыпічнага канцэртаў, сімф. паэм, фп. п'ес, хораў, песень, музыкі да фільмаў. Дзярж. прэміі Латв. ССР 1959 і 1970. Дэп. Вярх. Савета СССР 3—4-га скл. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.

ІВАНОЎ Яўген Аляксеевіч (н. 18.12.1924, Арэнбург), беларускі савецкі матэматык. Д-р фіз.-матэм. н. (1969), праф. (1970). Чл. КПСС з 1950. Удзельнік Айч. вайны. Скончыў БДУ (1956). У 1959—62 працаваў у Мінскім пед. ін-це, у 1962—70 у Ін-це матэматыкі АН БССР, заг. лабараторыі матэм. фізікі (з 1965). З 1970 дэкан ф-та прыкладной матэматыкі БДУ. Навук. працы ў галіне рашэння і даследавання задач матэм. тэорыі дыфракцыі хваляў.

Тв.: Дифракция электромагнитных волн на двух телах, Мн., 1968.

ІВАНОЎСКАЯ Марыя Раманаўна [н. 18(31).12.1912, в. Курманава Мсціслаўскага пав. Магілёўскай губ.], перадавік харчовай прамысловасці, Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1939. Удзельнічала ў Айч. вайне. З 1929 на Мінскай кандытарскай ф-цы: вучаніца, работніца, у 1936—67 майстар. Жыве ў Мінску.

ІВАНОЎСКІ Дзмітрый Іосіфавіч [28.10(9.11).1864, с. Ніз Гдоўскага пав. Пецярбургскай губ.— 20.4.1920], рускі батанік і мікрабіёлаг, заснавальнік вірусалогіі. Скончыў Пецярбургскі ун-т (1888). Прафесар Варшаўскага ун-та (1901—15), ун-та ў Растове-на-Дону (1915—20). Даследаваў спіртавое браджэнне, мікрабіялогію глебы, спадчыннасць і зменлівасць. Вывучаў хваробы тытуню. Першы (1892) экспериментальна даказаў існаванне нябачнага ў мікраскоп узбуджальніка тытунёвай мазаікі, які праходзіў праз бактэрыяльныя фільтры. Гэтая праца стала пачаткам вучэння пра вірусы.

Тв.: Избр. произв., М., 1953 (бібліягр.).

Літ.: Овчаров К. Е. Дмитрий Иосифович Ивановский, М., 1952.

ІВАНОЎСКІ Мікалай Міхайлавіч [5(18).3.1904, в. Лучоса Віцебскага пав.— 31.12.1943], удзельнік грамадз. вайны, ген.-м. (1944). З сялян. Чл. КПСС з 1922. Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1941). У кастр. 1917 у трынаццацігадовым узросце пайшоў у Цвярскі чырвонагвардзейскі атрад, потым у Чырв. Армію. У 1918—20 удзельнік баёў на Паўд. і Зах. франтах, разгрому кулацкіх мяцяжоў. У Айч. вайну на Варонежскім і 1-м Укр. франтах — нам. камандзіра, камандзір дывізіі. Загінуў у баі. Пахаваны ў Пераяслаў-Хмяльніцкім. Узнаг. 3 ордэнамі.

ІВАНОЎСКІ Станіслаў Антонавіч [н. 20.11(2.12).1893, в. Кеўралі Дрысенскага пав. Віцебскай губ.], удзельнік грамадз. вайны, ген.-м. (1944). З сялян. Чл. КПСС з 1919. Скончыў Віцебскія камандныя курсы (1920), курсы «Выстрал» (1925). У арміі з 1914, у Чырв. Арміі з мая 1919. У 1919 ваяваў на Зах., Паўд., Паўд.-Зах. і Туркестанскім франтах. З 1936 нам. нач. і нач. ваен. вучылішча. У Айч. вайну на Паўн.-Каўказскім і 4-м Укр. франтах — камандзір дывізіі. У 1946—54 нач. кафедры, абласны ваен. камісар. З 1954 у адстаўцы. Узнаг. ордэнам Леніна, 4 інш. ордэнамі, медалямі. Жыве ў Ташкенце.

ІВАНОЎСКІ Уладзімір Мікалаевіч [13(25).7.1867, Вышні Валачок Цвярской губ.— 4.1.1939], рускі філосаф, гісторык філасофіі і псіхалогіі. Прыват-дацэнт Маскоўскага (з 1899), Казанскага (з 1904) ун-таў, рэктар Самарскага ун-та (1920—21). Праф. БДУ (1921—27). Самастойнічаў развіццю навукі на Беларусі. Займаўся праблемамі асацыятыўнай псіхалогіі, гісторыі філасофіі, логікі і метадалогіі навукі. Імкнуўся аблізіцца з філасофіяй марксізма, але, знаходзячыся пад уплывам пазітывізму, памылкова лічыў «спрэчку паміж матэрыялізмам і ідэалізмам» неістотнай.

Тв.: Введение в философию, ч. 1, 2 изд., Казань, 1909; К вопросу о генезисе ассоциационизма, Казань, 1910; Из лекций по методологии наук, «Труды ВГУ», 1925, № 8—10, 1928, № 17—18; Наука и трудящиеся, «Вестник Народного комиссариата просвещения С.С.Р.Б.», 1922, № 5—8.

С. І. Дзерышаў. Мінск.

ІВАНОЎСКІ Яўген Піліпавіч (7.3.1918, мяст. Чарэя Сенненскага пав. Магілёўскай губ.), сав. ваен. дзеяч, ген.-палк. (1967). З сялян. Чл. КПСС з 1941. Скончыў Ваен. акадэмію механізацыі і матарызацыі (1941), Ваен. акадэмію Ген. штаба (1958). У Чырв. Арміі з 1936. Удзельнік сав.-фінляндскай вайны 1939—40. У Айч. вайну на Зах., Варонежскім, Сталінградскім, Паўн.-Зах., 1 і 2-м Бел. франтах. Удзельнік баёў пад Масквой, Сталінградам, Курскам, Усх.-прускай аперацыі, вызвалення Украіны, Польшчы. У 1945—57 на адказных пасадах у БВА, з 1959 у Маскоўскай ваен. акрузе. З чэрв. 1968 камандуючы войск Маскоўскай ваен. акругі. На XXIV з'ездзе КПСС выбраны чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета СССР 8-га скл. Узнаг. 9 ордэнамі, медалямі.



ІВАНСК, вёска ў Чашніцкім р-не Віцебскай вобл., на р. Ула. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Жданава. За 9 *км* на Пн ад Чашнікаў, 80 *км* ад Віцебска, 12 *км* ад чыг. ст. Чашнікі, на шашы Чашнікі — в. Бачэйкава. 147 ж., двароў 55 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, вет. пункт, аддз. сувязі, 2 магазіны. Помнік 27 сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну.

ІВАНЮТА Ганна Логвінаўна (н. 3.9.1929, в. Вялікія Фамёнкі Батурынскага р-на Заходняй вобл., РСФСР), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1965. У 1944—53 палявод, з 1954 звеняявая па вырошчванні лёну ў калгасе «Расія» (з 1970 калгас імя Леніна) Талачынскага р-на Віцебскай вобл.

Тв.: Хозяева льняных полей, Мн., 1965.

Літ.: Сцяганосцы новага, перадавога, Мн., 1967.

ІВАЦЭВІЦКІ РАЁН, у складзе Брэсцкай вобл. Утвораны 15.1.1940. Размешчаны на Пн вобл. Пл. 3,0 тыс. *км²*. Нас. 71,6 тыс. чал. (1971). Падзяляецца на 20 сельсаветаў; 2 гарады: Івацэвічы — цэнтр раёна і Косава, гар. нас. Целяханы.

Рэльеф плоска-ўзгоркавы на Пн і нізінны на Пд. Паўн. частку раёна займаюць схілы Слонімскага ўзв. з марэннымі градамі і камавымі ўзгоркамі, на ПдУ Баранавіцкая раўніна. Выш. 150—200 *м*. Паўд. частка ў межах Прыпяцкага Палесся. Выш. 100—150 *м* над узр. м. Карысныя выкапні: 4 радовішчы торфу з агульнымі запасамі 81 млн. *т* (у т. л. радовішчы Сухое — 45,5 млн. *т* і Заелава — 20,7 млн. *т*), радовішча мелу Дуброўка (каля в. Коланск) — 0,1 млн. *т*, 6 радовішчаў цагельнай сыравіны — 0,8 млн. *м³* (у т. л. радовішчы Амяльная — 0,25 млн. *м³* і Глінішча каля в. Даманава — 0,22 млн. *м³*), радовішча буд. пяскоў Быцень — 15,8 млн. *м³*. Сярэдняя т-ра студз. —5,5, ліп. 18,2 °С. Ападкаў 595 *мм* за год. Вегет. перыяд 198 дзён. Рэкі Шчара з прытокамі Мышанка і Грыўда; Жыгулянка (прыток Ясельды) і інш. Азёры Выганаўскае (Выганашчанскае) і Бабровіцкае. Многія рэкі і азёры злучаны каналамі. У межах раёна *Авінскі канал*. Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (26,7%), дзярнова-падзолістыя забалачальныя (21,1%), дзярнова-балотныя (9,6%), тарфяна-балотныя (42,6%). З мінер. глебаў 67,2% супясчаных, 32,8% пясчаных. Якасная ацэнка глебаў у балах: ворных зямель 44 (цана бала 0,28 *ц/га* збожжа), кармавых угоддзяў 38, усіх с.-г. угоддзяў 42. Пад лесам 46% тэр. Асн. лясныя масівы на ПнУ раёна. Амаль палову займаюць хвойныя (хвоя, елка), з лісцевых бяроза, вольха, асіна; трапляюцца дуб, граб, ясень. Насяляюць раён беларусы (94%), ёсць рускія, украінцы, яўрэі. Сярэдняя шчыльн. 23,9 чал. на 1 *км²*. Гарадскога нас. 19,8%.



Краявід у Мілейкаўскім сельсавеце.



Прамысл. лясная, лесахімічная, дрэваапр., буд. матэрыялаў, паліўная, харчовая. Прадпрыемствы: лесазавод, спіртаавод, маслазавод, лес-

прамгас, хімлясгас, раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі, камбінат быт. абслугоўвання (Іванцэвічы), дрэваапр. камбінат (Косава), камбінат буд. матэрыялаў (Даманава), лыжная ф-ка (Целяханы), торфапрадпр. «Бярозаўскае», 3 лясгасы. У раёне 17 калгасаў і 8 саўгасаў, доследна-балотная станцыя (1971).

Калгасы і іх цэнтры: «Бальшавік» *(Павстарынь)*, «Іскра» *(Магіліцы)*, імя Калініна *(Свята Воля)*, імя Кірава *(Воля)*, імя Куйбышава *(Горталь)*, імя Леніна *(Гошчава)*, «Любішчыцы» *(Любішчыцы)*, «Палеская праўда» *(Козікі)*, «Перамога» *(Вулька-Аброўскал)*, «Радзіма» *(Выганашчы)*, «Расія» *(Целяханы)*, «Савецкая Беларусь» *(Стайкі)*, «Світанне» *(Рэчкі)*, «40 гадоў Кастрычніка» *(Дабромысль)*, імя Суворава *(Бусяж)*, імя Чарткова *(Хавакі)*, «Шлях да камунізма» *(Грыўда)*. Саўгасы і іх цэнтры: «Быценскі» *(Быцень)*, «Даманава» *(Даманава)*, «Зара» *(Квасевічы)*, «Іванцэвіцкі» *(Яглевічы)*, «Косава» *(Косава)*, «Мілейкі» *(Мілейкі)*, імя Мічурына *(Амяльная)*, імя Чапаева *(Аброва)*; Косаўская доследна-балотная станцыя Беларускага НДІ меліярацыі і воднай гаспадаркі *(Майск)*.



Знішчэнне шкоднікаў на пасевах бульбы ў калгасе імя Калініна.

С. гасп. спецыялізуецца на малочна-мясной жывёлагадоўлі і буракаводстве ў спалучэнні з ільнаводствам; вырошчваюць бульбу і збожжавыя. Пад с.-г. ўгоддзямі 34% тэр. На пач. 1971 асушана 38,6 тыс. *га* балот і забалочаных зямель, у т. л. 27,4 тыс. *га* тарфянікаў. Агульная пасяўная пл. (тыс. *га*, 1971) 57,6, у т. л. пад збожжавымі і зернебабовымі 25,9, тэхнічнымі 2,5, бульбай 9,3, кармавымі культурамі 19,6. На пач. 1970 у раёне было (тыс. галоў) буйн. раг. жывёлы 54,2, у т. л. кароў 25,2; свіней 41,7, авечак і коз 7,7. Па тэр. раёна праходзяць чыгунка і шаша Мінск — Брэст. У 1971 у раёне было 24 сярэднія, 24 васьмігадовыя, 36 пач. школ, 4 школы рабочай і 2 сельскай моладзі, завочная школа, 15 дашкольных устаноў, 52 клубныя ўстановы, 68 масавых б-к, 60 кінаўстановак, у т. л. 56 стацыянарных, 6 бальніц, 31 фельч.-ак. пункт; дзіцячы саматычны санаторый «Сасновы Бор». У 1971 у раёне працавалі 560 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, у т. л. 18 інжынераў, 34 аграномы, 29 заатэхнікаў і вет. урачоў, 393 настаўнікі, 87 урачоў; 1488 чал. з сярэдняй спец. адукацыяй. Раённая газ. «Кастрычнік».

Ф. В. Зяньковіч. Брэст.

ІВАЦЭВІЧЫ, горад (з 1966), цэнтр Іванцэвіцкага р-на Брэсцкай вобл., на правым беразе р. Грыўды (бас. Нёмана). Чыг. і аўтобусная станцыя на лініі Мінск — Брэст. За 136 *км* на ПнУ ад Брэста. 8,0 тыс. ж. (1971).



Іванцэвічы. Вуліца Леніна.

Прамысл. прадпрыемствы: лесазавод, леспрамгас, хімлясгас, спіртзавод, маслазавод; раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі, камбінат быт. абслугоўвання. 2 сярэднія школы, школа рабочай моладзі, завочная, муз. і дзіцячая спарт. школы, дзіцячы сад і 2 дзіцячых яслядоў, Дом піянераў, кінатэатр, 2 клубы, 3 масавыя б-кі, бальніца. На брацкай магіле помнік 52 савецкім воінам і партызанам Айч. вайны. Каля Іванцэвічаў на шашы Мінск — Брэст помнік піянеру-герою К. *Гойшыку*. Абеліск на месцы пакарання ням.-фаш. акупантамі партыз. сувязнога В. Клютко.

Уз'яднаны з Расіяй у 1795. У 19 ст. невялікае сяло. Выраслі І. ў сувязі з пабудовай чыгункі. У часы бурж. Польшчы (1921—39) у складзе Косаўскага пав. Палескага ваяводства. У І. дзейнічала падпольная ячэйка КСМЗБ. Акупаваны з 24.6. 1941 да 12.7.1944 ням.-фаш. захопнікамі.

ІВА́ШКА МЯДЗВЕДЖАЕ ВУШКА (Іван Мядзведжы сын, Медзвядзюк), герой усходнеславянскіх чарадзейных казак пра юнака-асілка (тып 650 А па міжнар. паказальніку сюжэтаў), пра тры падземныя царствы (тып 301 В) і інш.

Вобраз Мядзведжага сына, які ідзе ад міфаў і легендаў і зрабіў уплыў на вобразы гераічнага эпаса некат. народаў, ёсць у казках многіх краін. Зах.-еўрап. казкі пра Мядзведжага сына часткова далучаюцца да анекдотаў пра дурных чарцей. Больш сац. сатыр. накіраванасць: асілак звычайна сутыкаецца і распраўляецца з панам, папом або царом, што асабліва выяўляецца ў бел. і укр. варыянтах. У бел. казках пра Мядзведжае вушка вобраз героя пад уплывам традыц. легендаў пра асілкаў набывае нярэдка фантаст. рысы волата.

Літ.: Беларускі эпас, Мн., 1959; Panzer F. Studien zur germanischen Sagengeschichte, Bd 1— Märchen vom Bärensohn. Beowulf, München, 1910.

Л. Р. Бараз. Уфа.

ІВА́ШКЕВІЧ (Iwaszkiewicz) Януш (16.2. 1879, маёнтак Гольчычы Слуцкага пав. Мінскай губ.— 6.8.1944), польскі ліберальна-буржуазны гісторык, архівіст. Праф. (1930). Скончыў Варшаўскі ун-т (1904). Працаваў у архівах Варшавы, у 1922—39 у Віленскім ун-це, адначасова ў Варшаўскай школе паліт. навук (1930—39). Вывучаў паліт. гісторыю Літвы і Беларусі 1-й пал. 19 ст. З лют. 1944 жыў у Варшаве. 5.8.1944 арыштаваны ням.-фаш. акупантамі і расстраляны.

Тв.: Litwa w roku 1812, Kraków — Warszawa, 1912; Wykaz dóbr ziemskich skonfiskowanych przez rządy zaborcze w latach 1773—1867, Warszawa, 1929.

А. П. Грыцкевіч. Мінск.

ІВА́ШКЕВІЧ (Iwaszkiewicz) Яраслаў (н. 20.2.1894, в. Кальнік Ліпавецкага пав. Кіеўскай губ.), польскі пісьменнік. У 1912—18 вучыўся ў Кіеўскім ун-це і ў кансерваторыі. У 1918 пераехаў у Варшаву. З 1955 рэдактар літ. час. «Twórczość» («Творчасць»). Друкуецца з 1915. У зб. вершаў «Васьмірадкоўі» (1919), «Дыянісіі» (1922) выявіліся мадэрністскія тэндэнцыі, захапленне антычнасцю. Ад абстрактных філас.-этычных праблем ранняй прозы І. пераходзіць да адлюстравання псіхал. канфліктаў, абумоўленых рэчаіснасцю (аповесць «Блэндомежскія страсці», 1938). Аўтар зб. вершаў «Іншае жыццё» (1938), гістар. рамана «Чырвоныя шчыты» (1934), драм «Лета ў Наане» (1936—37) і «Маскарад» (1939). Пасля 2-й сусв. вайны ў творчасці І. сцвярджаюцца ідэі сацыяліст. гуманізму, братэрства народаў, услаўляецца прыгажосць творчай працы (зб. вершаў «Алімпійскія оды», 1948; «Каса восені і іншыя вершы», 1954; «Заўтра жніво», 1963; кн. прозы «Італьянскія навелы», 1947; «Лісты з падарожжа ў Паўднёвую Амерыку», 1954; «Аер і іншыя апавяданні», 1960; аповесць «Каханкі з Мароны», 1961; п'еса «Аднаўленне Блэндомежа», 1951; і інш.). У рамане-эпапеі «Хвала і слава» (т. 1—3, 1956—62) асэнсаваны лёс польскага грамадства ад пач. 1-й сусв. вайны да стварэння ПНР. Аўтар «Кнігі маіх успамінаў» (1957), кн. пра Ф. Шапэна, І. С. Баха, К. Шыманоўскага і інш. Старшыня СП ПНР (1945—49, з 1959), чл. Сусв. Савета Міру. Міжнар. Ленінская прэмія «За ўмацаванне міру паміж народамі» за 1970. Дзярж. прэміі ПНР 1952, 1955 і 1970. Вершы І. на бел. мову перакладалі А. Вялюгін, М. Машара, Я. Семяжон, М. Танк, прозу — Я. Брыль, П. Стафановіч.



Тв.: Бел. пер.— у кн.: Сучасная польская паэзія, Мн., 1955; Ад Буга да Одры, Мн., 1969; у час.— «Полымя», 1952, № 5; там жа, 1955, № 4; там жа, 1965, № 3; там жа, 1967, № 1; там жа, 1969, № 7; рус. пер.— Избр. произв., М., 1964; Рассказы, М., 1958; Шопен, М., 1963; Хвала и слава, т. 1—3, М., 1965; Красные щиты, М., 1968.

В. І. Гапава. Мінск.

ІВА́ШЎЦІН Пётр Іванавіч [н. 23.8(5.9).1909, Брэст], сав. ваен. дзеяч, ген. арміі (1971). З рабочых. Чл. КПСС з 1926. Скончыў 2 курсы Ваен.-паветр. акадэміі імя Жукоўскага (1939). У Чырв. Арміі з 1931. Удзельнік сав.-фінляндскай вайны 1939—40. У Айч. вайну на Закаўказскім, Каўказскім, Крымскім, Паўн.-Каўказскім, Паўд.-Зах. і 3-м Укр. франтах. Удзельнік абароны Каўказа, вызвалення Югаславіі, Венгрыі і Аўстрыі. З 1945 на адказнай рабоце, з 1969 у Міністэрстве абароны СССР. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР 3, 7 і 8-га скліканняў. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 10 інш. ордэнамі, медалямі СССР, 2 ордэнамі замежных краін.



ІВА́ШЫН Васіль Уладзіміравіч [н. 26.4(9.5). 1913, в. Ляхавічы Мінскага пав.], беларускі савецкі літаратуразнавец. Правадз. чл. АПН СССР (1967), д-р філал. н. (1965). Чл. КПСС з 1945. З сялян. Скончыў Мінскі пед. ін-т імя М. Горкага (1938), працаваў выкладчыкам у Віцебскім пед. вучылішчы. Удзельнік Айч. вайны. З 1946 у Ін-це л-ры АН БССР, з 1967 дырэктар НДІ педагогікі Мін-ва асветы БССР. Друкуецца з 1949. Асн. працы пра творчасць Я. Купалы, пра развіццё рэалізму і вытокі сацыялісг. рэалізму ў бел. л-ры, руска-беларускія літ. сувязі. Аўтар (з В. В. Барысенкам) падручніка для 8-га кл. «Беларуская літаратура» (12 выд., 1971). Даследуе метадалогію і методыку выкладання л-ры ў школе.



Тв.: Янка Купала. Творчасць перыяду рэвалюцыі 1905—1907 гг., Мн., 1953; Рэвалюцыя 1905—1907 гг. і развіццё беларускай літаратуры, Мн., 1955; М. Горький и белорусская литература начала XX в., Мн., 1956; (з Н. С. Перкіным) Асноўныя асаблівасці развіцця сучаснай беларускай літаратуры, Мн., 1958; У истоков социалистического реализма, Мн., 1963; (з В. В. Барысенкам) Роля рускай класічнай літаратуры ў развіцці рэалізму беларускай літаратуры пачатку XX ст., Мн., 1963.

Літ.: Александрович С. Книга о горьковских традициях, «Советская Отчизна», 1956, № 6; Казека Я. Ля вытокаў сацыялістычнага рэалізму, «Полымя», 1963, № 12.

ІВЕНС (Ivens) Іорыс (н. 18.11.1898, г. Неймеген), галандскі кінарэжысёр і аператар, грамадскі дзеяч. Зрабіў уплыў на развіццё прагрэс. сусв. дакументальнага кіно. Асн. тэма творчасці — класавая, нац.-вызв. барацьба працоўных. Фільмы: «Песня пра герояў» (1932), «Барынаж» (1933), «Новая зямля» (1934), «Іспанская зямля» (1937), «Інданезія кліча» (1945), «Песня вялікіх рэк» (1954), «Сена сустракае Парыж» (1958), «Узброены народ» (1961) і інш. Міжнар. прэмія міру 1955, міжнар. Ленінская прэмія «За ўмацаванне міру паміж народамі» за 1967.

Літ.: Дробашенко С. Кинорежиссер Йорис Ивенс, М., 1964.

ІВЕРС Анатоль [сапр. Міско Іван Дарафеевіч; н. 2(15).5.1912, в. Чамяры Слонімскага пав. Гродзенскай губ.], беларускі савецкі паэт. Сын селяніна. За ўдзел у рэвалюц.-вызв. руху тройчы выключаўся польскімі ўладамі з бел. гімназій (Віленскай, Клецкай, Навагрудскай). Пасля ўз'яднання Беларусі літработнік слонімскай раённай газ. «Вольная праца». У Айч. вайну партызан, з сак. 1944 сакратар Слонімскага міжраённага антыфаш. камітэта. З 1965 у слонімскай раённай газ.

«За перамогу камунізма». Друкавацца пачаў (1933) у час. «Літаратурная старонка». Выступаў у час. «Асва», «Беларускі летапіс», «Калоссе». Першы зб. вершаў «Песні на загонах» (Вільня, 1939). Лірычны герой паэзіі І.— чалавек шырокіх грамадскіх імкненняў, пераўтваральнік, змагар. Аўтар «Паэмы пра камсамольца Валодзю Бялько» (1964).

Тв.: З пройдзеных дарог, Мн., 1970; У кн.: Сцягі і паходні, Мн., 1965.

Літ.: Надняманскія былі, Мн., 1968, с. 60—63.

І. П. Чыгрын. Мінск.

ІВЕСЬ, возера ў бас. р. Шошы (бас. Зах. Дзвіны), у Глыбоцкім р-не Віцебскай вобл. Пл. 0,55 *км*². Даўж. 2,1 *км*, найб. шыр. 0,5 *км*, сярэдняя 0,26 *км*, найб. глыб. 29 *м*, сярэдняя 7,7 *м*. Катлавіна выцягнута з Пн на Пд. Паўн. схіл умерана стромкі, выш. 15—17 *м*, астатнія спадзістыя і нізкія. Азёрная чаша падзяляецца на 3 плёсы, найбольш глыбакаводны паўночны. Дно ўслана крамянязёмістым аліўкавым ілам, літараль пясчана-галечная. Вадазбор (45,8 *км*²) дробнаўзгорысты і спадзіста-хвалісты. Каля берагоў воз. зараніку. Слаба праточнае: упадае пратока з воз. Малена, сцёк праз пратоку ў воз. Шо. Водзяцца лешч, плотка, шчупак, акунь і інш.

ІВЕСЬ, вёска ў Псуеўскім с/с Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл., каля воз. Шо (2 *км*). Цэнтр саўгаса «Івесь». За 51 *км* на У ад Глыбокага, 175 *км* ад Віцебска, 15 *км* ад чыг. ст. Зябкі. 104 ж., гасп. 29 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін.

ІВІЦКІ Андрэй Ігнатавіч [н. 31.5(13.6).1904, в. Светазер'е Чавускага пав. Магілёўскай губ.], беларускі савецкі вучоны ў галіне меліярацыі. Чл.-кар. АН БССР (1961). Д-р тэхн. н. (1958), праф. (1960). Чл. КПСС з 1944. Скончыў Горацкі с.-г. ін-т (1925). Удзельнік Айч. вайны. Кіраўнік водагаспадарчага сектара АН БССР (1946—48), нам. дырэктара па навук. рабоце Бел. НДІ меліярацыі і воднай гаспадаркі (1948—51), з 1948 заг. аддзела асушэння гэтага інстытута. Распрацоўвае прынцыпы і метады меліярацыі балот і пераўвільготненых глебаў Беларусі; тэорыю разліку адлегласцей паміж дрэнамі, метад разліку перадпасяўнога сцёку, водааддачы грунтоў і інш. Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі.



Тв.: Принципы проектирования закрытого дренажа в Белорусской ССР, Мн., 1954; Осушительное действие закрытого дренажа в минеральных почвах, у кн.: Мелиорация и использование осушенных земель, Мн., 1968 (Труды Бел. НИИ мелиорации и водного хозяйства, т. 16); Способы осушения болот в зависимости от подпочвы, у кн.: Мелиорация и использование осушенных земель, Мн., 1969 (там жа, т. 17).

ІВОЛЬСК, вёска ў Буда-Кашалёўскім р-не Гомельскай вобл., на р. Іволька. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Калініна. За 25 *км* на Пд ад Буда-Кашалёва, 40 *км* ад Гомеля, 25 *км* ад чыг. ст. Уза, на аўтамаб. дарозе Гомель — Жлобін. 397 ж., гасп. 149 (1971). Лесапільня, млын, камбінат быт. абслугоўвання, мех. майстэрня. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў Айч. вайны.

ІВУЦЁНКА Мікалай Іванавіч (19.5.1921, в. Утра Чавускага пав. Магілёўскай губ.— 27.4.1945), кавалер ордэнаў Славы трох ступеняў. З сялян. Чл. КПСС з 1944. У Чырв. Арміі з 1940. У Айч. вайну на Паўд.-Зах., Сталінградскім, Варонежскім, 2 і 1-м Укр. франтах — камандзір гарматы. Вызначыўся ў крас. 1945 каля в. Мюльразе (Германія); 15.4.1945 пры прарыве варожай абароны прамой наводкай знішчыў процітанкавую гармату, станковы кулямёт; 19.4.1945 адбіваў контратакі ворага і знішчыў 3 станковыя кулямёты. Памёр ад ран.

ІВЯНЕЦ, гар. пасёлак (з 1940) у Валожынскім р-не Мінскай вобл., на р. Волма. За 31 *км* на ПдУ ад Валожына, 65 *км* ад Мінска, 40 *км* ад чыг. ст. Койданава. 3,7 тыс. ж. (1971). Прамысл. прадпрыемствы: ф-ка маст. керамікі і вышыўкі (гл. *Івянецкая кераміка*), кансервавы з-д, хлебакамбінат, племянны птушказавод, прамкамбінат, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя і муз. школы, школа рабочай моладзі, дзіцячы сад і яслі, дом-інтэрнат для дзяцей з фіз. недахопамі, 2 б-кі, Дом культуры, кінатэатр, бальніца, дзіцячы касцёва-туберкулёзны санаторый. Эксперым. база Мінскага праектна-тэхнал. ін-та. У Івянцы *Дзяржынскага Ф. Э. музей*. Помнік Дзяржынскаму. Мемарыяльная дошка на доме, дзе жыў Фрунзе. Помнік на магіле Казіміра і Люцыі Дзяржынскіх (гл. *Дзяржынскі К. Э.*). Помнік 142 сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну. Помнік архітэктуры — касцёл 18 ст.

І. вядомы з 14 ст. Належаў вял. кн. Вітаўту, пазней кн. Андрэю Уладзіміравічу, Салагубам. Штогод наладжваліся кірмашы. За 12 *км* ад І., у маёнтку Дзяржынава, нарадзіўся Ф. Э. Дзяржынскі. У 1916 тут жыў і працаваў М. В. *Фрунзе*. У вер. 1917 у І. арганізаваны валасны Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Сав. ўлада ўстаноўлена ў ліст. 1917. У 1921—39 у складзе бурж. Польшчы. Акупаваны з чэрв. 1941 да 6.7.1944 ням.-фаш. захопнікамі. У Айч. вайну на тэр. раёна дзейнічала *Івянецкае партызанскае злучэнне*. З 15.1.1940 да 17.4.1962 цэнтр Івянецкага р-на.

Івянец. Вуліца Камсамольская.



ІВЯНЕЦКАЕ ПАРТЫЗАНСКАЕ ЗЛУЧЭННЕ ў гады Вялікай Айчыннай вайны, злучэнне партыз. брыгад і атрадаў, якія змагаліся з ням.-фаш. захопнікамі на тэр. паўн.-ўсх. р-наў Баранавіцкай і Валожынскага Вілейскай абл.

Створана ў крас. 1943 паводле рашэння Баранавіцкага падпольнага абкома КП(б)Б. Камандзір — першы сакратар Івянецкага міжраённага падпольнага к-та КП(б)Б Р. А. Сідарок (Дубаў), чл. штаба: Р. Л. Васілевіч, У. К. Курленка, Г. В. Будай. Да кастр. 1943 І. п. з. дзейнічала на тэр. Івянецкага, Стаўбцоўскага, Карэліцкага і Мірскага р-наў Баранавіцкай і Валожынскага Вілейскай абл. Яднала партыз. брыгады імя Сталіна, імя Чкалава, імя Жукава, імя Фрунзе, асобы кав. атрад і некалькі груп, усяго каля 3 тыс. чалавек. 2.10.1943 Стаўбцоўскі, Карэліцкі, Мірскі р-ны, партыз. брыгада імя Жукава і асобы кав. атрад падпарадкаваны ўтворанаму Стаўбцоўскаму міжраённаму падпольнаму к-ту КП(б)Б. У снеж. 1943 брыгада імя Фрунзе перададзена ў зону паўд. р-наў Баранавіцкай вобл. На базе брыгад імя Сталіна і імя Чкалава пазней створаны брыгады імя Далржынскага, імя Чкалава, імя Панамарэнкі, імя Шчорса, «За Савецкую Беларусь». На дзень злучэння з Сав. Арміяй І. п. з. яднала 4 брыгады: імя Сталіна, імя Чкалава, імя Шчорса, імя Панамарэнкі і асобна дзейны атрад № 106 (гл. адпаведныя артыкулы пра партыз. брыгады і асобна дзейны атрад). Усяго каля 4,5 тыс. партызанаў. Байцы злучэння ў крас. 1943 — ліп. 1944 падарвалі 452 вайсковыя эшалоны, каля 5,5 тыс. рэек, 1165 аўтамашын, разбілі 202 гарнізоны, валасныя ўправы, а-ды і варожыя склады, знішчылі больш за 23 тыс. і ўзялі ў палон 3,5 тыс. фашыстаў.

Я. Д. Гапееў. Мінск.

ІВЯНЕЦКАЯ КЕРАМІКА, традыцыйныя народныя вырабы з мясцовай гліны ў г. п. Івянец (Валожынскі р-н Мінскай вобл.). Промысел узнік у старажытнасці, найб. росквіту дасягнуў у канцы 19 — пач. 20 ст. Выраблялі пераважна прадметы традыц. нар. ўжытку: гаршкі, глякі, збаны, міскі. Іх вызначала своеасаблівая прыгажосць вуглаватых формаў, а таксама геаметрычны ўзор — гарызантальныя палосы з зацёкамі (мясцовы варыянт дэкору — «фляндроўкі»), якія ўкрывалі вырабы накшталт паласатай тканіны. Найб. разнастайныя формы і росліс мелі вазы, чайнікі, хлебніцы, салатнікі; папулярны матыў іх аздобы — яловыя галінкі ў спалучэнні з лісцем і травою. З канца 19 ст. выраблялі таксама кафлі (квадратныя, гладкія ці рэльефныя, з геам. і раслінным узорам, з аднатоннай белай, зялёнай, карычневай паліваю) і керамічныя дэкар. дэталі для печаў. Была пашырана гліняная скульптура — цацкі і дэкар. фігуркі жывёл, звычайна пацягнутыя цёмна-карычневай паліваю. На базе промыслу ў 1960 створана Івянецкая ф-ка маст. керамікі і вышыўкі, якая выпускае графіны, збаны, вазы, сувеніры, анімалістычную скульптуру. Сярод майстроў І. к.— Ф. Целішэўскі, В. Кулікоўскі, І. Малчановіч, А. Пракаповіч, М. Звярко, С. Адамовіч і інш.

Узоры традыцыйнай івянецкай керамікі.



Літ.: Елатомцева И. М. Художественная керамика Советской Белоруссии, Мн., 1966.

І. М. Ялатамцава. Мінск.

ІГАР (г. п. невядомы — 945), вялікі князь кіеўскі з 912, пачынальнік дынастыі Рурыкавічаў. На пач. княжання пакарыў славянскія плямёны паміж Днястром і Дунаем, задушыў паўстанне драўлян. Правёў паходы (913, 943) у Закаўказзе. У 941 хадзіў на Канстанцінопаль, але пацярпеў паражэнне; у выніку 2-га паходу ў 944 заключыў з Візантыяй выгадны дагавор. Першы з рус. князёў у 914 сутыкнуўся з печанегамі, з якімі заключыў перамір'е на 5 гадоў. Забіты драўлянамі пры спробе паўторна сабраць з іх палюддзе (даніну).

Літ.: Повесть временных лет, ч. 1—2, М.— Л., 1950 (гл. Паказальнік імён); Греков Б. Д. Киевская Русь, М., 1953.

ІГАР СВЯТАСЛАВІЧ (1151—1202), князь ноўгарад-северскі з 1178, чарнігаўскі з 1198. Удзельнік феад. войнаў 12 ст. за княжанне ў Кіеве, запрашаў на дапамогу полаўцаў, што садзейнічала разарэнню Паўд. Русі. Наступленне полаўцаў прымусіла І. С. ўступіць у барацьбу з імі. У 1185 арганізаваў паход некалькіх рус. князёў супраць полаўцаў, аднак быў разбіты і трапіў у палон да хана Канчака, адкуль уцёк. Гэты паход стаў асновай сюжэта «Слова аб палку Ігаравым».

Літ.: Слово о полку Игореве, 3 изд., М.— Л., 1961; Купала Я. Слова аб палку Ігаравым, Ігара, сына Святаслаўлева, унука Алегава.— Слова аб палку Ігаравым, Збор твораў, т. 5, Мн., 1962.

ІГАЎКА, вёска ў Крупецкім с/с Добрушскага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр саўгаса «Новы шлях». За 14 *км* на ПдУ ад Добруша, 30 *км* ад Гомеля, 11 *км* ад чыг. ст. Добруш. 169 ж., гасп. 75 (1971). Васьмігадовая школа, Дом культуры, дзіцячы сад, фельч.-ак. пункт. У жн. 1943 вёску спалілі ням.-фаш. захопнікі.

ІГЕЛЬСТРОМ Канстанцін Густававіч (Яўстаф'евіч) (8.5.1799, мяст. Шумск Валынскай губ.— 13.11.1851), рэвалюц. дзеяч, адзін з кіраўнікоў т-ва *«Ваенныя сябры»*. З ваенных. Служыў капітанам у Літоўскім корпусе (Беластоцкая вобл.). Вёў антыўрадавую прапаганду ў войсках. Меў сувязь з дзекабрыстам В. К. Кюхельбекерам. Піянерны (сапёрны) батальён, адной з рот якога камандаваў І., першы адмовіўся ад прысягі Мікалаю І у снеж. 1825. У 1827 засуджаны да пакарання смерцю, заменена 10-гадовай катаргай, якую адбываў з дзекабрыстамі ў Сібіры.

ІГЛАСКУРЫЯ (Echinodermata), тып марскіх беспазваночных. Вядома 6000 відаў, аб'яднаных у 5 класаў: марскія зоркі (Asteroidea), афіуры, або змеяхвосткі (Ophiuriidea),

марскія вожыкі (Echinoidea), марскія агуркі, або *галатурыі* (Holothurioidea), марскія лілеі (Crinoidea).

Цела жывёл мае форму зоркі, шара, агурка, кветкі або бутона на сцябле, памерам 5—50 *см* (2 *м*). Свабоднарухомыя або прымацаваныя. Водаснасудзістая (амбулакральная) сістэма служыць для перамяшчэння свабоднарухомых і для дыхання прымацаваных да дна відаў. Будове цела І. характэрны прамяністая (радыяльная) сіметрыя і вапністы ўнутраны шкілет з шыпамі або іголкамі на паверхні. Жывуць І. ў морах і акіянах усіх шырот. Размнажаюцца пераважна палавым спосабам. Большасць корміцца жывёльнай ежаю (чарвякамі, крабамі, рыбаю, малюскамі), некаторыя — водарасцямі і рэшткамі наземнай расліннасці. І. ўдзельнічаюць у падтрыманні пэўнага солевага саставу марской вады, здольныя здабываць з яе і назапашваць у поласцевай вадкасці радыеактыўныя рэчывы. І. кормяцца траска, пікша, камбала, зубатка, марская выдра (калан). Марскія зоркі шкодзяць промыслу (знішчаюць вустрычныя банкі, ядуць рыбу і вял. ракападобных). *Трэпангі*, ікра марскіх вожыкаў ядомыя. Іл. гл. на ўкл.

Літ.: Жизнь животных, т. 2, М., 1968.

Г. А. Галкоўская. Мінск.

ІГЛІЦА (шыпулькі), лісце многіх хвойных дрэў і кустоў тыпу голанасенных.

Лінейнай, ігла- або лускападобнай, трох-, чатырохгранай формы; даўж. 0,1—30 *см*. Зверху ўкрыта цвёрдаю скуркаю з невял. колькасцю вусцейкаў. У большасці хваёвых І. трымаецца на галінках 1—15 гадоў. Мае шмат фітанцыдаў, эфірных алеяў, вітамінаў.

ІГНАЛІНА, вёска ў Чапаеўскім с/с Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл., каля воз. Асвейскага (2 *км*). Цэнтр калгаса «Авангард». За 44 *км* на ПнУ ад Верхнядзвінска, 219 *км* ад Віцебска, на шашы Верхнядзвінск — Себеж (РСФСР). 149 ж., двароў 44 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, вет. пункт, аддз. сувязі, магазін. У сак. 1943 І. спалілі нямец.-фаш. захопнікі.

ІГНАТАВА Марыя Якаўлеўна (н. 25.9.1930, в. Паловікі Лёзненскага р-на, БССР), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1960). Чл. КПСС з 1960. Прац. дзейнасць пачала ў 1945 у калгасе імя Сталіна (з 1956 у складзе саўгаса «Крынкі») Лёзненскага р-на Віцебскай вобл. У 1957—68 жывёлавод племсаўгаса «Крынкі». З 1968 у Крынкаўскім аддз. сувязі. Дэп. Вярх. Савета БССР 5-га скл.

ІГНАТОВІЧ Фёдар Пятровіч [н. 1(14).3.1910, в. Анеліна Аршанскага пав. Магілёўскай губ.], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Віцебскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1939. З 1928 рабочы на прадпрыемствах Масквы. У Чырв. Арміі з 1939, у партызанах з лют. 1943. З чэрв. 1943 камісар *партызанскай брыгады М. П. Гудкова* Віцебскай вобл. З 1944 на сав. рабоце. Узнаг. ордэнам Айч. Вайны 1-й ступені, медалямі. Жыве ў Талачыне Віцебскай вобл.

ІГНАТОЎСКІ Усевалад Макаравіч (19.4.1881, в. Токары Брэсцкага пав. Гродзенскай губ.— 4.2.1931), беларускі гісторык і грамадскі дзеяч. З сям'і настаўніка. Чл. КПСС з 1920. Скончыў Юр'еўскі ун-т (1911). З 1901 да кастр. 1917 чл. партыі эсэраў. За ўдзел у рэвалюц. руху пяраз арыштоўваўся. У 1919—20 змагаўся ў падполлі супраць польскіх акупантаў. У 1914—20 выкладчык Мінскага настаўніцкага (з 1919 пед.) ін-та, у 1920—21 нарком земляробства, у 1921—26 нарком асветы БССР. Праф. БДУ, дэкан факультэтаў грамадскіх і пед. навук, нам. рэктара ун-та. З 1926 старшыня Інбелкульта. З 1928 правадз. чл. АН БССР, з студз. 1929 да студз. 1931 яе прэзідэнт. Займаўся распрацоўкай гісторыі Беларусі. Напісаў шэраг навуковых прац, сярод якіх «Кароткі нарыс гісторыі Беларусі» (1919), «Гісторыя Беларусі ў XIX і ў пачатку XX стагоддзя» (3 выд., 1928) і «1863 год на Беларусі» (1930). У сваіх працах І. не паказваў усёй складанасці сацыяльнага развіцця на розных этапах, не даваў належнай марксісцкай характарыстыкі эпохі, разглядаў гістар. падзеі з нацыяналіст. пазіцый. На VII з'ездзе КП(б)Б выбіраўся кандыдатам у чл. ЦК, на VIII—XIII з'ездах КП(б)Б чл. ЦК, чл. бюро ЦК КП(б)Б (1925—30); чл. ЦВК БССР (1920—30), чл. Прэзідыума ЦВК БССР (1924—30), чл. ЦВК СССР (1925—27). На пленуме ЦК КП(б)Б (кастр. 1930) выведзены з чл. бюро ЦК і чл. ЦК КП(б)Б, паст. прэзідыума і парткалегіі ЦКК КП(б)Б (студз. 1931) выключаны з партыі як нацыянал-ухіліст.



ІГНАЦЁНКА Іларыён Мяфодзьевіч (н. 28.12. 1919, в. Дамамеркі Рэчыцкага пав. Гомельскай губ.), беларускі савецкі гісторык. Чл.-кар. АН БССР (1969). Д-р гістар. н. (1965), праф. (1966). З сялян. Чл. КПСС з 1942. Скончыў Гомельскі пед. ін-т (1950). У 1939—47 у Ваенна-Марскім Флоце, у 1947—50 і 1958—60 на парт. рабоце ў Гомелі і ў Мінску. З 1953 у Бел. дзярж. ун-це. У 1966—69 дырэктар Ін-та гісторыі партыі пры ЦК КПБ, з 1969 дырэктар Ін-та гісторыі АН БССР. Аўтар прац па гісторыі Кастр. рэвалюцыі і ўстанаўлення Сав. улады на Беларусі, адзін з рэдактараў «Нарысаў гісторыі Камуністычнай партыі Беларусі» (ч. 2, 1967) і аўтараў кнігі «Перамога Савецкай улады на Беларусі» (1967).

Тв.: Беднейшее крестьянство — союзник пролетариата в борьбе за победу Октябрьской революции в Белоруссии (1917—1918 гг.), Мн., 1962; (разам з У. Р. Івашыным) Кастрычнік у Беларусі, Мн., 1967.

ІГНАЦЕНКА Ілья Яфрэмавіч (н. 2.8.1920, в. Шыпунова Ішымскага пав. Табольскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1943. На фронце з 1941. Вызначыўся ў Віцебскай вобл. 16.6.1944 разведчык І. выявіў 3 артыл. і 2 мінамётныя батарэі, 6 дзотаў, 8 агнявых кропак, якія пазней знішчаны артылерыяй. 24.6.1944 адзін з першых фарсіраваў Зах. Дзвіну, удзельнічаў у баі за плацдарм. Жыве ў Чарнігаве.

ІГНАЦЁНКА Рыгор Мікалаевіч (15.6.1906, в. Калбасічы Рэчыцкага пав. Мінскай губ.— 14.7.1969), адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Пінскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл.



Ігласкурыя. Марскія зоркі: 1. Seramaster patagonicus. 2. Oreaster nodosus. 3. Henricia sanguinolenta. 4. Crossaster papposus. Афіўры: 5. Ophiura sarsi. 6. Ophiomastix annulosa. Галатурыі: 7. Trochostoma arcticum. 8. Brandtothuria arenicola. 9. Cucumaria tricolor. 10. Psolus chitonoides. Марскія вожыкі: 11. Strongylocentrotus purpuratus. 12. Stylocidaris affinis. 13. Diadema setosum. Марскія лілеі: 14. Metacrinus nobilis. 15. Pterometra pulcherrima.



Кандытарская прамысловасць. Прадукцыя кандытарскіх прадпрыемстваў рэспублікі.

КПСС з 1938. З 1925 рабочы чыгункі, старшыня сельсавета, калгаса ў Палескай вобл., з 1940 на парт. рабоце ў Пінскай вобл. З чэрв. 1941 на фронце, палітрук роты. У крас.— жн. 1942 на Асобым беларускім зборы. У партызанах з жн. 1942 — камісар атрада, з жн. 1943 да мая 1944 камісар *партызанскай брыгады імя С. М. Будзённага* Пінскай вобл., адначасова сакратар Ленінскага падпольнага райкома КП(б)Б. Пасля вайны першы сакратар Ленінскага райкома КП(б)Б Пінскай, Ульскага Віцебскай абл. З кастр. 1957 дырэктар саўгаса, ільнозавода ў Лёзненскім р-не. На XIX—XXI з'ездах КПБ выбраны канд. у чл. ЦК. Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі.

ІГНАЦЬЕЎ Міхаіл Купрэевіч [н. 22.11(5.12). 1904, в. Юркавічы Гарадоцкага пав. Віцебскай губ.], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Вілейскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1931. З 1924 на сав. рабоце ў Гарадоцкім р-не. У партызанах з мая 1942 — палітрук узвода, камісар атрада, з ліп. 1943 камісар *партызанскай брыгады «Спартак»* Вілейскай вобл. З жн. 1944 старшыня Відзскага райвыканкома. У 1945—63 на сав. і гасп. рабоце ў Шаркоўшчынскім р-не. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі. Жыве ў Шаркоўшчыне.

ІГНАЦЬЕЎ Руф Гаўрылавіч [7(19).9.1829, Масква — 2(14).1.1886], гісторык, археолаг, этнограф, музыказнаўца. Скончыў Лазараўскі ін-т усх. моў (Масква) і кансерваторыю (Парыж). У 1877—80 чл. Мінскага стат. к-та і рэдактар газ. «Минские губернские ведомости». Раскопваў курганы на Міншчыне, склаў карту археал. помнікаў Мінскага пав., падрыхтаваў матэрыялы для археал. карты Арэнбургскай губ. Выкладаў спевы ў Мінскіх жаночых школе і гімназіі. Збіраў бел. народныя песні. У 1879 накіраваў на Антрапалаг. выстаўку ў Маскву 100 нотных запісаў песень Мінскай губ. і апісанне бел. нар. інструментаў. Аўтар многіх артыкулаў па археалогіі і гісторыі Ноўгарадскай, Арэнбургскай і Мінскай губ.

Тв.: Марьина Горка Игуменского уезда, «Минские губернские ведомости», 1877, № 24; Местечко Заславль или Изяслав — город потомков Рогнеды, там жа, 1878, № 1—2; Курганы и городища в Минской губернии, там жа, 1878, № 51—52; 1879, № 1—8, 10—11, 14, 17—18.

Літ.: Дубінскі С. А. Бібліяграфія па археалогіі Беларусі і сумежных краін, Мн., 1933.

Л. В. Аляксееў. Масква.

ІГНІТРО́Н [лац. ignis агонь + (*элек*)*трон*], кіроўны электрычны ртутны *вентыль*, у якім кожнае ўзнікненне галоўнага дугавога разраду робіцца ад падпальніка (паўправадніковага стрыжня, апушчанага ў ртуць).



Ігнітрон для аднафазавых аварачных машын: *1* — ртуць; *2* — падпальнік; *3* — анод.

Для сілкавання падпальніка ўжываюцца спец. электронныя схемы запальвання. І. выкарыстоўваецца для кіравання пераменным токам, выпрамлення пераменнага току, у інвертарных установках (гл. *Інвертар*) і інш.

ІГРУШКА, вёска ў Крупскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Грушаўскі». За 18 *км* на Пн ад Крупак, 136 *км* ад Мінска, 12 *км* ад чыг. ст. Крупкі, на аўтамаб. дарозе, якая злучае вёску з Крупкамі. 698 ж., гасп. 212 (1971). Філіял раённага камбіната быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, вет. пункт, аддз. сувязі, сталовая, 2 магазіны. Помнік 101 земляку, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ІГУМЕН, назва *Чэрвеня* да 1924.

ІГУМНАЎ Канстанцін Мікалаевіч [19.4(1.5). 1873, г. Лебядзянь Тамбоўскай губ.— 24.3.1948], рускі савецкі піяніст і педагог, стваральнік адной з найб. значных сав. піяністычных школ. Нар. арт. СССР (1946). Д-р мастацтвазнаўства (1946). У 1899—1948 праф. Маск. кансерваторыі (у 1924—29 рэктар). Сярод вучняў І. праф. Бел. кансерваторыі засл. дз. маст. БССР Г. Пятроў, засл. арт. БССР Е. Эфрон. Дзярж. прэмія СССР 1946.

ІДАЛІШЧА ПАГА́НАЕ, паўфантастычны сатырычны персанаж былін «Ілья і Ідалішча», рус. і бел. казак пра *Ілью Мурамца*. Значнае сац. абагульненне ў вобразе І. П. дасягаецца шляхам гратэскавага спалучэння рысаў агіднага, пражорлівага страшыдла і нахабнага, прагнага ваеннага захопніка.

Вобраз І. П. блізкі да Тугарына-змея і Калінацара — вобразаў гвалтаўнікоў-ворагаў з былін. У бел. казках сюжэт пра І. П. ператвараецца часам вельмі своеасабліва, амаль да непазнавальнасці (напр., у казцы «Пра Ігра Ігравіча, пра старога Палугрыма» з кн. У. М. Дабравольскага «Смаленскі этнаграфічны зборнік», ч. 1, СПб., 1891).

Літ.: Беларускі эпас, Мн., 1959; Пропп В. Я. Русский героический эпос, 2 изд., Л., 1958; Астахова А. М. Народные сказки о богатырях русского эпоса, М., 1962.

Л. Р. Бараг. Уфа.

ІДАЛЬ Эдуард Антонавіч [10(23).1.1909, Віцебск — 22.1.1942], дзеяч рэвалюц. руху ў Зах. Беларусі. З сям'і чыгуначніка. Чл. КПСС з 1929. У 1927—30 на камсамольскай рабоце ў Віцебску. З 1931 на падпольнай рабоце ў Зах. Беларусі: інструктар ЦК КПЗБ па Брэсцкай і Гродзенскай акр., сакратар Віленскага акр. к-та КПЗБ; у 1932 заг. аддзела па ваен. рабоце ЦК КПЗБ. У 1933 сакратар Беластоцкага акр. к-та КПЗБ. Удзельнічаў у падрыхтоўцы і кіраўніцтве 3-месячнай забастоўкай тэкстыльшчыкаў Беластоцкага прамысл. р-на, якая закончылася перамогай рабочых. У 1933—35 чл. сакратарыята ЦК КПЗБ, потым на прафс. рабоце ў Віцебску.

С. Р. Анісаў. Мінск.

ІДОЛТА, возера ў бас. Вяты, левага прытока Зах. Дзвіны, у Міёрскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 0,5 *км*². Даўж. 1,5 *км*, найб. шыр. 0,5 *км*, сярэдняя 0,3 *км*. Катлавіна выцягнута з Пн на Пд, размешчана сярод марэнных узгоркаў. Вадазбор (8,5 *км*²) паката-хвалісты, складзены з марэны. Воз. моцна зарастае. Водзяцца плотка, верхаводка, лешч, шчупак, язь, мянтуз, акунь, карась.

ІДОЛТА, вёска ў Павяцкім с/с Міёрскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр саўгаса «Міёрскі». За 15 *км* на ПнЗ ад Міёраў, 205 *км* ад Віцебска, 7 *км* ад чыг. ст. Друя. 274 ж., двароў 74 (1970). Клуб, б-ка, дзіцячы сад, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ІДЫЁМА (грэч. idiōma асаблівасць), устойлівы непадзельны зварот у мове, значэнне якога не вынікае са значэння слоў, што ўваходзяць у гэты зварот. Адзін з яркіх выяўленчых сродкаў пэўнае мовы.

Структурна І. не аднастайныя: адны супадаюць са словазлучэннямі («смаловы дуб» — небыліца, неверагоднае, нерэальнае), другія — са злучнікавымі спалучэннямі («ні да вока ні да бока» — непрыгодны, непрыдатны, непатрэбны), трэція — са сказамі («хоць ты махалам махай» — не адбіцца, не адагнацца). Гэтае супадзенне, аднак, толькі вонкавае. І. ўжываюцца ў мове літаральна так, як і асобныя словы. У І. сустракаюцца незразумелыя з пункту погляду сучаснасці словы і формы слоў: у выразе «бібікі біць» незразумелае слова «бібікі», у выразе «абое рабое» сінтаксічна не абумоўленая і не адпавядае сучасным нормам бел. мовы форма слова «абое». Не заўсёды зразумелы вобраз, які ляжыць у аснове І., напр. «трубою віцца». *Ф. М. Янкоўскі.* Мінск.

ІДЫШ, сучасная размоўная і літаратурная мова часткі яўрэяў Усх. Еўропы і Амерыкі. Уваходзіць у зах. падгрупу германскіх моў.

Склалася ў 10—12 ст. у выніку ўзаемадзеяння верхненям. дыялектаў з семіцкімі (стараж.-яўрэйскімі, арамейскімі) і слав. элементамі. У гісторыі І. вылучаюць 3 перыяды: старажытны (да 16 ст.), сярэдні (16—18 ст.) і новы (з 18 ст.). У 16—18 ст. І. адмежаваўся ад ням. мовы, утварыліся дыялекты — польскі, украінскі, літоўска-беларускі і інш., якія адрозніваюцца пераважна фанетыкаю. На сінтаксіс І. пэўны ўплыў зрабілі слав. мовы, лексіка пераважна нямецкая, ёсць слав. і стараж.-яўрэйскія запазычанні. Алфавіт яўрэйскі (гл. *Яўрэйскае пісьмо*).

ІДЫЯМАРФІЗМ, здольнасць мінералаў, якія крышталізуюцца ў магме, набываць характэрныя (ідыяморфныя) крышталаграфічныя контуры. Калі вонкавыя формы мінералу падпарадкоўваюцца формам інш. мінералаў, узнікаюць алатрыяморфныя яго формы.

ІДЫЯТЫЯ, форма разумовай недаразвітасці Гл. ў арт. *Алігафрэнія*.

ІДЭАГРАФІЧНАЕ ПІСЬМО (грэч. idéa ідэя+grapho пішу), адзін з тыпаў пісьма, знакі якога (ідэаграмы) абазначаюць звычайна не гукі і не склады, а паняцці. Асноўныя сістэмы І. п.: *егіпецкае пісьмо*, месапатамскі клінапіс (гл. *Клінапіс*), пісьмо мая, *кітайскае пісьмо*. Ідэаграфічнымі наз. таксама сістэмы фармальных моў, у якіх знакі не выражаюць сэнсу (гл. *Значэнне і сэнс*).

І. п. ўзнікла на аснове *піктаграфічнага пісьма*. У І. п. малюнкі паступова трацілі непасрэднае значэнне і ператвараліся ў знакі прадметаў (напр., малюнак вока абазначаў вока і здольнасць бачыць). У некат. сістэмах пісьма (егіпецкім, месапатамскім і інш.) ідэаграмы з часам ператварыліся ў фанет. знакі і ўзніклі алфавіты, у іншых (напр., кітайскім) захавалася І. п. ў выглядзе іерогліфікі (гл. *Іерогліфы*).

Літ.: Дирингер Д. Алфавит, пер. с англ., М., 1963; Лоукотка Ч. Развитие письма, пер. с чешск., М., 1950. *А. Я. Міхневіч.* Мінск.

ІДЭАЛ (ад грэч. idéa вобраз, паняцце), узор, дасканаласць у чым-небудзь, вышэйшая мэта, якая вызначае імкненні і паводзіны чалавека або грамадскага класа. Адрозніваюць І. грамадскі (узор дасканалага грамадскага ладу), эстэтычны (узор *прыгожага*), маральны, этычны (уяўленне пра дасканалыя якасці асобы і адносіны паміж людзьмі).

Прадстаўнікі ідэаліст. філасофіі разглядаюць І. у адрыве ад рэчаіснасці, як нешта, чаго нельга ажыццявіць, або імкнуцца навязаць рэчаіснасці суб'ектыўныя, надуманыя І. Першай формай пераадолення бурж. І. ў гісторыі былі вучэнні прадстаўнікоў утапічнага сацыялізма, але іх І. перабудовы грамадства грунтаваліся на абстрактных прынцыпах розуму і справядлівасці.

Марксізм-ленінізм упершыню даў навук. тлумачэнне прыроды і сутнасці І., паказаў рэальныя шляхі іх дасягнення. І. могуць быць ажыццёўлены толькі тады, калі адпавядаюць аб'ектыўным заканамернасцям развіцця грамадства і калі за іх ажыццяўленне змагаюцца прагрэс. сілы. У І. выяўляецца разуменне заканамернасцей і неабходнай перспектывы, адлюстраванне таго, што ўжо ёсць, і таго, што можа і павінна быць у выніку грамадскага развіцця. У эпоху пераходу ад капіталізму да сацыялізма ідзе працэс крушэння рэакц. І. буржуазіі, усталявання і перамогі перадавых І. камунізма. Ажыццяўленне прагрэс. І. чалавецтва адбываецца ў барацьбе працоўных за ліквідацыю прыватнай уласнасці, рэвалюц. пераўтварэнне грамадства, пабудову камуніст. ладу.

Літ.: Маркс К. и Энгельс Ф. Немецкая идеология, Соч., т. 3; Маркс К. Крытыка Гоцкай праграмы, Мн., 1968; Ленін У. І. Што такое «прыяцелі народа» і як яны ваююць супраць сацыял-дэмакратаў?, Тв., т. 1 (Полн. собр. соч., т. 1); яго ж. Задачы саюзаў моладзі, Тв., т. 31 (там жа, т. 41); Целикова О. П. Коммунистический идеал и нравственное развитие личности, М., 1970; Ильенков Э. В. Об идолах и идеалах, М., 1968; Боровский М. И. О критерии нравственности, Мн., 1970. *М. І. Бароўскі.* Мінск.

ІДЭАЛАГІЧНЫЯ АСНОВЫ КПСС, вучэнне пра сацыяліст. ідэалогію партыі рабочага класа, пра значэнне гэтай ідэалогіі ў класавай барацьбе пралетарыяту, у пабудове сацыялізма і камунізма, пра ролю марксісцкай партыі ў распрацоўцы і пашырэнні навуковай рэвалюц. тэорыі сярод рабочага класа, у камуністычным выхаванні працоўных, у рэвалюц. пераўтварэнні грамадства. І. а. КПСС распрацаваў У. І. Ленін, апіраючыся на тэарэт. спадчыну К. Маркса і Ф. Энгельса, вопыт расійскага і міжнар. рабочага руху. Гал. умовай поспеху пралетарыяту ў барацьбе за ўладу Ленін лічыў згуртаванне рабочага класа, стварэнне ім самастойнай паліт. партыі. Стварэнню партыі новага тыпу папярэднічала вялікая ідэйна-тэарэт. дзейнасць Леніна, яго барацьба супраць рус. і міжнар. апартунізму. Вырашальную ролю ў гэтым адыгралі газ. *«Искра»* і праца Леніна «Што рабіць?», якія залажылі І. а. КПСС. Ленін вучыў, што сацыяліст. ідэалогія пралетарыяту не вырастае стыхійна з рабочага руху, а нараджаецца з навукі як тэарэт. абагульненне вопыту рэвалюц. барацьбы пралетарыяту, як натуральны вынік развіцця перадавой рэвалюц. думкі і ўносіцца ў рабочы рух паліт. партыяй пралетарыяту; што партыя з'яўляецца паліт. правадыром і кіраўніком рабочага класа, вышэйшай формай яго класавай арг-цыі, якая заклікана ўносіць сацыяліст.

свядомасць у рабочы рух; што марксісцкая партыя ёсць злучэнне рабочага руху з сацыялізмам. «Без рэвалюцыйнай тэорыі,— пісаў Ленін,— не можа быць і рэвалюцыйнага руху. ...Ролю перадавога барацьбіта можа выканаць толькі партыя, кіруемая перадавой тэорыяй» (Тв., т. 5, с. 341—342). Такой рэвалюц. тэорыяй з'яўляецца марксізм-ленінізм, сацыяліст. ідэалогія пралетарыяту, навук. выражэнне яго карэнных інтарэсаў. Ленін даказаў, што паміж сацыяліст. і бурж. ідэалогіяй ідзе непрымірымая барацьба. Усякае прыніжэнне сацыяліст. ідэалогіі, усякае адхіленне ад яе вядзе да ўзмацнення ідэалогіі буржуазнай. Ленінскія палажэнні аб значэнні рэвалюц. тэорыі, аб тым, што марксісцкая партыя ёсць злучэнне рабочага руху з сацыялізмам, аб партыі як рэвалюцыянізуючай, арганізуючай і кіруючай сіле рабочага руху ляглі ў аснову ідэалогіі КПСС. Ідэйнае адзінства Ленін лічыў асновай магутнасці партыі, крыніцай яе сілы. Ленінскае вучэнне пра І. а. КПСС развіта далей у рашэннях з'ездаў, у Праграме КПСС. І. а. КПСС маюць сусв.-гістар. значэнне. Яны — узор усім камуніст. і рабочым партыям. Гл. таксама арт. *Марксізм-ленінізм*, *Камуністычная партыя Савецкага Саюза*.

Літ.: Ленін У. І. Што рабіць?, Тв., т. 5 (Полн. собр. соч., т. 6); Ленинское учение о партии, М., 1969; Костин А. Ф. Ленин — создатель партии нового типа, М., 1970. *М. Ф. Капіч.* Мінск.

ІДЭАЛІЗАЦЫЯ, мысленнае канструяванне аб'ектаў, якія матэрыяльна не існуюць і не могуць быць створаны, але маюць у аб'ектыўнай рэчаіснасці свае правобразы. Ідэальныя (абстрактныя) аб'екты ўвасабляюць у «чыстым выглядзе» істотныя моманты, прыкметы, уласцівасці той ці іншай з'явы або рэчы, дазваляюць спрасціць складаную праблему, лепш аддзяліць істотнае ад неістотнага, матэматычна строга фармуляваць законы навукі. Ідэальныя аб'екты ўводзяцца і выкарыстоўваюцца рознымі навукамі («пункт», «прамая лінія» ў матэматыцы, «абсалютна цвёрдае цела», «ідэальны газ» у фізіцы і інш.). Пры дэдукцыйным пабудаванні тэорый яны становяцца ідэальнымі мадэлямі аб'ектыўных працэсаў (гл. *Мадэляванне*). Цераз шэраг *інтэрпрэтацый* ідэалізаваныя аб'екты і тэорыі супастаўляюцца з рэальнай рэчаіснасцю. Крытэрый ісціннасці тых ці іншых І.— практыка (у т. л. практыка назірання і эксперымента); пры гэтым ствараецца магчымасць выкарыстоўваць практыку, якая фіксуецца ў законах логікі.

Працэс І. адбываецца ў розных формах. Асн. з іх: шматступеннае абстрагаванне (гл. *Абстракцыя*), абагульненне, у прыватнасці шматразовае карыстанне *абстракцыяй атаясамлівання*; мысленны пераход да гранічнага выпадку пры разглядзе ўмоў існавання якой-н. уласцівасці; наданне аб'екту прыкмет, якіх ён не мае, але мог бы мець пры некат. умовах. Ідэалізаваныя аб'екты могуць уводзіцца таксама сістэмай пастулатаў (у дэдукцыйных тэорыях) пры ўмове, што адпаведныя паняцці ўжо сфармуляваны з дапамогай І. іншага віду.

Літ.: Горский Д. П. Вопросы абстракции и образования понятий, М., 1961; Субботин А. Л. Идеализация как средство научного познания, у кн.: Проблемы логики научного познания, М., 1964; Артюх А. Т. О природе абстрактных объектов и способах их построения, у кн.: Логика и методология науки, М., 1967. *У. М. Сацута.* Мінск.

ІДЭАЛІЗМ (франц. idéalisme ад грэч. idéa паняцце, уяўленне), філасофскі кірунак, які ў процілегласць *матэрыялізму* прызнае першаснасць ідэальнага ў адносінах да матэрыяльнага. Памылкова вырашаючы *асноўнае пытанне філасофіі*, разумее свет як выяўленне духу, які абвяшчаецца першаасновай і дэміургам усіх з'яў, суб'ектам усякіх змен. Так ці інакш прызнае стварэнне свету і тым самым выступае як рафінаваная форма рэлігіі. Гнасеалагічныя карэнні І.— у абсалютызацыі, перабольшванні пэўных момантаў пазнання. Гэта абумоўлена складанасцю і супярэчлівасцю працэсу пазнання. «...Філасофскі ідэалізм ёсць аднабаковае, перавялічанае, überschwengliches (Dietzgen) развіццё (раздзіманне, распуханне) адной з рысачак, бакоў, граней пазнання ў абсалют, адарваны ад матэрыі, ад прыроды, абагатвораны» (Ленін У. І. Тв., т. 38, с. 352—353). Магчымасць уяўляць пэўныя ўласцівасці рэчаў або іх адносіны па-за самімі рэчамі вядзе да памылковага палажэння пра самастойнае існаванне іх у адрыве ад матэрыяльных носьбітаў. Чым вышэйшы ўзровень абстракцыі, тым большыя рэальныя магчымасці ідэалістычнага адрыву думкі ад рэчаіснасці. Памылковае разуменне працэсу пазнання вядзе і да таго, што ідэальнасць адчуванняў пераносіцца на рэчы, якія адчуваюцца, і быццё гэтых рэчаў тлумачыцца іх існаваннем у свядомасці чалавека. Адчуванні адрываюцца ад навакольнага свету, набываюць рысы самастойнасці і выкарыстоўваюцца як «будаўнічы матэрыял» пры стварэнні ва ўяўленні чалавека ілюзіі існавання свету. Абсалютызацыя адноснай недасканаласці органаў пачуццяў і адноснасці ведаў людзей спараджае розныя формы *скептыцызму* і *агнастыцызму*. Формы І. адрозніваюцца тым, які бок пазнання яны ўзводзяць у абсалют. «Прамалінейнасць і аднабаковасць, застыласць і акасцянеласць, суб'ектывізм і суб'ектыўная слепата voilà гнасеалагічныя карэнні ідэалізму» (там жа, с. 353). І. мае глебу ў класавай арганізацыі эксплуататарскага грамадства. Класы — носьбіты ідэаліст. светапогляду — з развіццём грамадства зменьваліся, але звычайна гэта былі эксплуататарскія класы. Яны падтрымлівалі і абаранялі І., замацоўвалі дзеля сваіх інтарэсаў ідэаліст. адрыў думкі ад рэчаіснасці, спрыялі пашырэнню асобных памылковых вывадаў і ператварэнню іх у закончаныя ідэаліст. сістэмы, былі зацікаўлены ва ўтойванні ісціны, у скажоным ідэаліст. адлюстраванні свету.

І. як філас. кірунак узнік у першых класавых грамадствах. У працэсе развіцця ўвасабляўся ў розныя гістар. формы, набываў выгляд самастойных кірункаў, школ, плыняў, выступаў пад рознымі імёнамі. Галоўныя з іх — аб'ектыўны і суб'ектыўны І., падзел якіх залежыць ад рознага разумення характару духоўнай субстанцыі свету. Аб'ектыўны І. лічыць, што ідэальная сіла, якая стварае свет, існуе аб'ектыўна, незалежна ад свядомасці чалавека або чалавецтва. У розных філас. сістэмах яна прымае розныя канкрэтныя ўвасабленні: царства чыстых паняццяў (Платон), лік

(Піфагор), манады (Г. В. Лейбніц), абсалютная ідэя (Гегель), сусветная воля (А. Шапенгаўэр), чыстая энергія (В. Ф. Оствальд) і інш. Найвышэйшае развіццё аб'ектыўны І. атрымаў у класічнай ням. філасофіі (Шэлінг і асабліва Гегель). У сучаснай бурж. філасофіі да яго належаць *неатамізм*, *персаналізм*, неагегельянства і інш. Суб'ектыўны І. лічыць, што ідэальная сіла, якая стварае свет, уласціва самому суб'екту. Паводле *махізму* рэчы — комплексы адчуванняў суб'екта, іх рэальнасць ставіцца ў залежнасць ад яго ўспрыманняў, мыслення, вымяральных аперацый, эксперыментаў і інш. Крайняя форма суб'ектыўнага І.— *саліпсізм*. У сучаснай бурж. філасофіі суб'ектыўны І.— пануючая плынь (*неапазітывізм*, *прагматызм*, неарэалізм, *экзістэнцыялізм*, *фенаменалогія*, філасофія жыцця і інш.). Найбольш вядомыя прадстаўнікі суб'ектыўнага І.— Дж. Берклі, Д. Юм, І. Г. Фіхтэ, Э. Мах, Р. Авенарыус. Адрозненне паміж аб'ектыўным і суб'ектыўным І. не абсалютнае. Яны сыходзяцца ў сцвярджэнні духоўнасці свету. Межы, якія іх падзяляюць і якія раней былі дастаткова рэзкія, паволі становяцца ўсё менш выразныя. Асобныя іх элементы нярэдка аб'ядноўваюцца ў межах адной філас. школы. Вылучаюцца і інш. адценні І.: дыялектычны (І. Кант, Фіхтэ, Шэлінг, Гегель); метафізічны, які пераважае ў сучаснай бурж. філасофіі; маністычны (Фіхтэ, Гегель); плюралістычны (Лейбніц); сенсуалістычны (Берклі, Авенарыус); рацыяналістычны (Р. Дэкарт, Гегель); ірацыяналістычны (М. Хайдэгер, К. Ясперс) і інш.

І. у цэлым адмоўна ўплываў і ўплывае на развіццё чалавечага пазнання, запавольвае прагрэс навукі. Сучасныя формы І. выкарыстоўваюцца для абгрунтавання *антыкамунізму*. Матэрыялізм вядзе непрымірымую барацьбу супраць І. ва ўсіх яго формах і разнавіднасцях. Гэтая барацьба складае асн. змест шматвяковай гісторыі філас. думкі. Асн. прынцыпы навук. крытыкі І. былі распрацаваны У. І. Леніным, які даў бліскучыя ўзоры крытычнага аналізу і ідэйнага разгрому асн. школ І. канца 19 — пач. 20 ст.

Літ.: Маркс К. и Энгельс Ф. Немецкая идеология, Соч., т. 3; Энгельс Ф. Людвіг Феербах і канец класічнай нямецкай філасофіі, Мн., 1953; Ленін У. І. Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм, Тв., т. 14 (Полн. собр. соч., т. 18); яго ж. Філасофскія сшыткі, Тв., т. 38 (там жа, т. 29); яго ж. Аб значэнні ваяўнічага матэрыялізму, Тв., т. 33 (там жа, т. 45); Современный субъективный идеализм, М., 1957; Современный объективный идеализм, М., 1963; Современная идеалистическая гносеология, М., 1968; Черкашин П. П. Гносеологические корни идеализма, М., 1961; Ковалгин В. М. Марксистская философия против идеализма и метафизики, Мн., 1961.

А. У. Самускевіч. Мінск.

ІДЭАЛО́ГІЯ (грэч. idéa ідэя, вобраз+...*логія*), сістэма ідэй і поглядаў, якія адлюстроўваюць адносіны людзей да навакольнай рэчаіснасці. Асн. формы І.— паліт., прававыя, маральныя, рэліг., этычныя, эстэт. і філас. погляды. І. адрозніваюць ад *сацыяльнай псіхалогіі*.

І. ўзнікае як адлюстраванне ў свядомасці людзей іх грамадскага быцця, як тэарэт. мысленне выпрацоўваецца ідэолагамі класа. Развіваецца на аснове ведаў і ўяўленняў, выпрацаваных раней, але ўкладвае ў іх новы змест. Здольная актыўна ўздзейнічаць на эканоміку і інш. бакі грамадскага жыцця (гл. *Базіс і надбудова*). У класавым грамадстве І. заўсёды мае класавы характар. Тут пануе І. кіруючага класа, які выкарыстоўвае яе для ўвекавечвання парадкаў, якія існуюць. Барацьба І. ў антаган. грамадскіх фармацыях адлюстроўвае барацьбу класаў.

І. пралетарыяту — *марксізм-ленінізм*. Аб'ектыўная аснова навуковасці і прагрэсіўнасці І. пралетарыяту — супадзенне яго інтарэсаў і мэт з аб'ектыўнымі патрабаваннямі грамадскага развіцця. І. сучаснай буржуазіі — класа эксплуататараў — антынавуковая і рэакцыйная. Мірнае суіснаванне і спаборніцтва дзвюх сістэм не азначаюць прымірэння бурж. і сацыяліст. І. Патрэбны актыўная барацьба супраць І. буржуазіі, выкрыццё яе рэакц. сутнасці і ролі. Марксісцка-ленінская І.— тэарэт. аснова палітыкі камуніст. партыі, неабходны сродак у барацьбе супраць імперыялізму, у пабудове сацыялізма і камунізма. Гл. таксама *Светапогляд*.

Літ.: Маркс К. и Энгельс Ф. Немецкая идеология, Соч., т. 3; іх жа. Маніфест Камуністычнай партыі, Мн., 1968; Маркс К. Капітал, т. 1, Мн., 1952, с. 3—9; Энгельс Ф. Анты-Дзюрынг, Мн., 1952; Ленін У. І. Тв. [гл. Даведачны т., ч. 1 (Справочный т. к Полн. собр. соч., ч. 1)]; Праграма Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Мн., 1961;. Матэрыялы XXIV з'езда КПСС, Мн., 1971; Программные документы борьбы за мир, демократию и социализм, М., 1964; Дакументы міжнароднай Нарады камуністычных і рабочых партый, Масква, 5—17 чэрвеня 1969 года, Мн., 1969; Да 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна. Тэзісы ЦК КПСС, Мн., 1969; Ядов В. А. Идеология как форма духовной деятельности общества, Л., 1961; Давідзюк Г. П. Марксісцкая ідэалогія і буржуазная дэідэалагізацыя, Мн., 1970.

У. І. Горбач. Мінск.

ІДЭА́ЛЬНАЕ, суб'ектыўнае адлюстраванне аб'ектыўнага свету, якое ўзнікае ў мэтазгоднай дзейнасці чалавека і з'яўляецца адным з яе момантаў. Праблема суадносін матэрыяльнага і І.— галоўная ў гісторыі філасофіі (гл. *Асноўнае пытанне філасофіі*). Марксісцка-ленінская філасофія прызнае першаснасць матэрыяльнага і залежнасць І. «...Ідэальнае,— пісаў К. Маркс,— ёсць не што іншае, як матэрыяльнае, перасаджанае ў чалавечую галаву і пераўтворанае ў ёй» (Капітал, т. 1, Мн., 1952, с. 19).

І. адлюстроўвае навакольны свет у формах дзейнасці людзей, іх свядомасці і волі. Яно выступае як процілеглае матэрыяльнаму, характарызуе якасную прыроду свядомасці. Процілегласць матэрыі і свядомасці, матэрыяльнага і І. мае дыялект. характар. З дапамогай катэгорый матэрыяльнага і І. паглыбляецца разуменне пазнання як выніку практ. ўзаемадзеяння суб'екта і аб'екта. І.— адзін з бакоў гэтага ўзаемадзеяння. Яно не проста адлюстраванне матэрыяльнага, а форма яго іншабыцця, якая выяўляецца ў чалавечай дзейнасці. Матэрыяліст. дыялектыка прызнае рэальнасць І. Аднак, калі матэрыяльнае існуе аб'ектыўна і служыць крыніцай І., то І. суб'ектыўнае і ўвасабляецца ў матэрыяльным дзякуючы практ. дзейнасці чалавека.

Літ.: Маркс К. и Энгельс Ф. Немецкая идеология, Соч., т. 3; Энгельс Ф. Дыялектыка прыроды, Мн., 1954; яго ж. Анты-Дзюрынг, Мн., 1952; Ленін У. І. Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм, Тв., т. 14 (Полн. собр. соч., т. 18); яго ж. Філасофскія сшыткі, Тв., т. 38 (там жа, т. 29); Кузьмин В. Ф. Философская категория сознания и современная наука, М., 1964; Нарский И. С. Диалектическое противоречие и логика познания, М., 1969; Пузиков П. Д. Аналитическая способность мышления, Мн., 1965; Рубинштейн С. Л. Бытие и сознание, М., 1957; Копнин П. В. Философские идеи В. И. Ленина и логика, М., 1969.

Ю. А. Гусеў. Мінск.

ІДЭА́ЛЬНЫ ГАЗ, уяўны *газ*, малекулы якога ўзаемадзейнічаюць паміж сабою толькі пры ўзаемных ударах і ўласны аб'ём малекул якога роўны нулю. Вельмі разрэджаныя рэальныя газы паводле сваіх уласцівасцей набліжаюцца да І. г.

ІДЭНТЫФІКА́ЦЫЯ (лац. identificare атаясамліваць), метад крыміналістыкі, які ўжываецца для вызначэння тоеснасці прадметаў або людзей па іх характэрных адзнаках; важны сродак доказаў пры расследаванні і судовым разглядзе спраў. Метадам І. выяўляецца асоба па адбітках пальцаў рук (гл. *Дактыласкапія*), па почырку (гл. *Экспертыза графічная*), фотаздымку; выяўляюцца транспартныя сродкі па іх слядах; зброя па стрэляных гільзах і інш. Пашырана ў судовай медыцыне (гл. *Экспертыза судова-медыцынская*). Ужываецца таксама пры гістарычных, археалагічных і літаратуразнаўчых даследаваннях. Пры правядзенні І. выкарыстоўваюцца найноўшыя дасягненні навукі і тэхнікі (электронна-вылічальныя машыны і інш.).

Літ.: Новоселова Н. А. Криминалистическая идентификационная экспертиза, Мн., 1966; Колдин В. Я. Идентификация и ее роль в установлении истины по уголовным делам, М., 1969; Сегай М. Я. Методология судебной идентификации, Киев, 1970.

А. В. Дулаў. Мінск.

ІДЭ́Я (грэч. idéa выгляд, род, вобраз, спосаб), у шырокім сэнсе — думка, намер, план; у філасофіі і логіцы — форма адлюстравання рэчаіснасці, якая выяўляе галоўную думку, накіроўны тэарэт. прынцып, сутнасць, закон існавання і развіцця з'яў.

У розных філас. сістэмах катэгорыя І. ўжываецца па-рознаму. У сістэмах аб'ектыўнага ідэалізму (Платон, сярэдневяковыя рэалісты, Гегель, неатамісты) І.— сутнасць рэчаў, якая аб'ектыўна існуе, духоўны першапачатак і творца рэчаіснасці. Суб'ектыўны ідэалізм (Берклі, прагматысты, махісты, неапазітывісты) атаясамлівае І. з рэчамі, лічыць прадметы і працэсы матэрыяльнага свету комплексам або сукупнасцю адчуванняў чалавека.

Дыялект. матэрыялізм разглядае І. як адлюстраванне аб'ектыўнай рэальнасці ў яе магчымасцях, тэндэнцыях і ў развіцці, выяўляе сутнасць І. як формы мыслення і яе функцыі ў пазнанні. Лічыць І. важнай формай пазнання навакольнага свету, якая не толькі адлюстроўвае аб'ект, але і накіроўвае яго пераўтварэнне. Крытэрый правільнасці І.— грамадска-гістар. практыка чалавека. Роля І. у грамадскім развіцці вызначаецца тым, якому класу — прагрэсіўнаму ці рэакцыйнаму — яны належаць, наколькі правільна яны выяўляюць патрабаванні матэрыяльнага жыцця грамадства. І. марксізма-ленінізма, якія адлюстроўваюць жыццёвыя інтарэсы рабочага класа, большасці чалавецтва, з'яўляюцца прагрэсіўнымі. І. сучаснай бурж. філасофіі і сацыялогіі, рэвізіянізму і рэлігіі, што адлюстроўваюць інтарэсы рэакц. класаў, рэакцыйныя, бо затрымліваюць развіццё грамадства.

Літ.: Маркс К. и Энгельс Ф. Немецкая идеология, Соч., т. 3, с. 16—49; Энгельс Ф. Анты-Дзюрынг, Мн., 1952; Ленін У. І. Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм, Тв., т. 14, с. 12—14, 214—215 (Полн. собр. соч., т. 18, с. 15—17, 238—239); яго ж. Філасофскія сшыткі, Тв., т. 38, с. 179—225 (там жа, т. 29, с. 174—219); Праграма Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Мн., 1961; Да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. Тэзісы ЦК КПСС, Мн., 1969; Копнин П. В. Идея как форма мышления, Киев, 1963.

У. У. Качаноўскі. Мінск.

ІЕГАВІ́СТЫ (саманазва «Таварыства сведак Іеговы»), адна з найбольш рэакцыйных чалавеканенавісніцкіх хрысціянскіх сектаў. Узнікла ў 70-я г. 19 ст. сярод дробнай буржуазіі ЗША ў выніку расколу *адвентыстаў*, потым пашырылася ў інш. краінах. Больш за 600 тыс. членаў (1970).

Веравучэнне І. у значнай ступені падобнае да адвентысцкага, але ў цэлым выходзіць за межы хрысціянства. І. адмаўляюць траічнасць бога, прызнаюць адзінага «бога-бацьку» Іегову (гл. *Яхве*). Гісторыю свету ўяўляюць як барацьбу Іеговы з Сатаной, абвяшчаюць увасабленнем Сатаны ўсё прагрэсіўнае, перадавое. Прадказваюць блізкую канчатковую бітву сіл Іеговы і сіл Сатаны — армагедон, у якой загінуць усе людзі, акрамя І. На тэрыторыі Савецкай дзяржавы І. з'явіліся пасля ўз'яднання з СССР заходніх абласцей Беларусі і Украіны, прыбалтыйскіх рэспублік і Бесарабіі. Секты існуюць нелегальна, вядуць варожую Сав. уладзе і сацыялізму дзейнасць; колькасць іх памяншаецца.

Літ.: Бартошевич Э. М. и Борисоглебский Е. И. Свидетели Иеговы, М., 1969; Марціросаў Г. А. Хто такія іегавісты, Мн., 1961.

Дз. М. Мацяс. Мінск.

ІЕГО́ВА, бог у іудзейскай рэлігіі. Гл. *Яхве*.

ІЕ́НА, 1) старажытная манета Японіі. Залатая І. змяшчала 1,5 *г* золата, сярэбраная — 24,3 *г* серабра. 2) Грашовая адзінка Японіі (з 1871). 1 І.=100 сен, 1 сен=10 рын. Паводле афіц. курсу Дзяржбанка СССР на 24.12.1971 1000 І.=2,69 руб.

ІЕРО́ГЛІФАЎ ТЭО́РЫЯ, агнастычны пункт гледжання ў тэорыі пазнання, паводле якога адчуванні — толькі ўмоўныя знакі (сімвалы, іерогліфы), а не адлюстраванне аб'ектыўных уласцівасцей рэчаў. Навуковая беспадстаўнасць І. т. і прынцыповае адрозненне тэорыі адлюстравання ад І. т. паказаны У. І. Леніным у кнізе «Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм».

Літ.: Ленін У. І. Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм, Тв., т. 14 (Полн. собр. соч., т. 18); Ярошевский М. Г. История психологии, М., 1966, с. 219—230, 274—281; Левин Г. А., В. И. Ленин и современные проблемы теории познания, Мн., 1970, с. 127—181; Уваров Л. В. Образ, символ, знак (Анализ современного гносеологического символизма), Мн., 1967.

ІЕРО́ГЛІФЫ (грэч. hieroglyphoi свяшчэнныя пісьмёны), пісьмовыя знакі ў некат. відах *ідэаграфічнага пісьма* для абазначэння не гукаў, як літары (графемы) у алфавіце, а асобных слоў і паняццяў. У такіх відах пісьма налічваюць сотні і нават тысячы знакаў. І. могуць быць і фанетычнымі сімваламі — абазначаць склады і асобныя гукі. Няправільна атаясамліваць адчуванні з І., што выражана ў ідэаліст. *іерогліфаў тэорыі*.

ІЕРУСАЛІ́М, горад на Блізкім Усходзе. Вузел аўтамаб. дарог, чыг. ст. Аэрапорт. 210 тыс. ж. (1964). Харч., тэкст., метала- і дрэваапр., радыётэхнічная, гарбарна-абутковая, фармацэўтычная, тытунёвая, шкляная, палігр. прамысловасць. Саматужная вытворчасць прадметаў рэліг. культу. Выш. мусульманская школа, археал. музей, Нац. музей мастацтва.

І.— цэнтр рэліг. культу трох рэлігій. Прыхільнікі іудаізму, хрысціянства і ісламу шануюць яго як «святы горад». Упершыню ўпамінаецца ў сярэдзіне 2-га тысячагоддзя да н. э. Каля 1000 да н. э. (быў на гэты час крэпасцю хананеяў) захоплены Ізраільска-Іудзейскім царствам і стаў яго сталіцай, каля 935 да н. э.— сталіца Іудзейскага царства. У 586 да н. э. вавілонскае войска захапіла і разбурыла І. У канцы 6 ст. да н. э. пачаў адбудоўвацца. У 63 да н. э. заняты рымлянамі. Цэнтр Іудзейскай вайны 66—73; захоплены і раз-

бураны рымлянамі ў 70 н. э. У 638 завяваны арабамі. У 1099 захоплены крыжакамі, у 1187 — егіпцянамі. У 1517—1917 у складзе Асманскай імперыі. З 1920 адм. ц. англ. мандатнай тэр. Палесціны. 29.11.1947 Ген. Асамблея ААН прыняла рашэнне пра будучы статус І. як самастойнай адзінкі, якая карыстаецца асобным міжнар. рэжымам. У выніку араба-ізраільскай вайны 1948—49 ізр. войскі захапілі зах., большую ч. І. (т. зв. «Новы горад»), а Іарданія заняла ўсх., т. зв. «Стары горад». У студз. 1950 у парушэнне рэзалюцыі ААН Ізраіль аб'явіў І. сваёй сталіцай і перавёў у яго зах. частку многія ўрадавыя ўстановы. У чэрв. 1967 у выніку агрэсіі супраць арабскіх краін Ізраіль захапіў усх. частку І. і аб'явіў пра ле анексію. 5-я надзвычайная спец. сесія Генеральнай Асамблеі ААН сваімі рэзалюцыямі ад 4 і 14 ліп. 1967 залічыла, што дзеянні Ізраіля ў І. не маюць законнай сілы, заклікала адмяніць іх і паперад адмовіцца ад якіх-небудзь мер па змяненні статусу горада. У парушэнне рэзалюцый ААН ізраільскія акупанты захопліваюць землі арабаў ва ўсходняй частцы І., зносяць іх дамы і ставяць уласныя будынкі.

У «Старым горадзе» асталіся часткі каменнай муроўкі 10 ст. да н. э., рэшткі хрысціянскіх помнікаў 4—5 ст. (ратонды «Труны божай», базілікі на Маслічнай гары і інш.). Узоры арабскай архітэктуры: мячэці Кубат ас-Сахра (т. зв. мячэць Амара; 687—691) і аль-Акса (пач. 8 ст.). Шмат цэркваў 11—16 ст. «Новы горад» пачаў забудоўвацца ў 2-й пал. 19 ст.

ІЕРУСАЛІМСКІ Мікалай Дзмітрыевіч [4(17).1.1901, Тула — 16.5.1967], савецкі мікрабіёлаг. Акад. АН СССР (1966; чл.-кар. 1960). Чл. КПСС з 1946. Скончыў Маскоўскі ун-т (1931). Працаваў у н.-д. хіміка-фармацэўтычным ін-це ў Маскве, Цэнтр. н.-д. лабараторыі брадзільнай прамысл., Ін-це мікрабіялогіі АН СССР (1930—61). З 1961 у Ін-це біяхіміі і фізіялогіі мікраарганізмаў, з 1966 дырэктар гэтага ін-та. Асн. працы па фізіялогіі і біяхіміі мікраарганізмаў, заканамернасцях іх росту і развіцця. Стварыў перадумовы для матэм. мадэлявання працэсаў бесперапыннага культывавання мікраарганізмаў і залажыў асновы развіцця шэрагу мікрабіял. вытворчасцей. Распрацоўваў праблему мікрабіял. атрымання бялкоў з нафтапрадуктаў. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.

Тв.: Азотное и витаминное питание микробов, М.—Л., 1949; Основы физиологии микробов, М., 1963.

ІЖА, вёска ў Вілейскім р-не Мінскай вобл., на р. Нарачанка. Цэнтр сельсавета і калгаса «Світанне». За 24 *км* на ПнЗ ад Вілейкі, 127 *км* ад Мінска, на аўтамаб. дарозе Вілейка — Свір. 612 ж., двароў 196 (1971). Лясніцтва, камбінат быт. абслугоўвання, сепаратарны пункт, млын. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, вет. лячэбніца, адда. сувязі, 4 магазіны. Помнік на брацкай магіле 40 сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны.

ІЖОРСКАЯ ЗЯМЛЯ (Іжора), тэрыторыя народнасці іжора па берагах Нявы і ўзбярэжжы Фінскага заліва. У 13—15 ст. падпарадкавана Ноўгараду. У 1478 далучана да Маскоўскага княства. Пасля Лівонскай вайны (у 1581—90) і ў час інтэрвенцыі пач. 17 ст. зах. частка І. з. (г. Ям, Капор'е, Івангарад з паветамі) захоплена Швецыяй. Вернута Расіі ў час *Паўночнай вайны 1700—21*.

Літ.: Гадзяцкий С. С. Борьба русских людей Ижорской земли в XVII в. против иноземного владычества, у зб.: Исторические записки, т. 16, М., 1945; Ягож. Ижорская земля в начале XVII в., там жа, т. 21, М., 1947.

ІЖЎСК, горад, сталіца Удмурцкай АССР, на р. Іж, за 40 *км* ад ля ўпадзення ў Каму. Вузел чыг. і аўтамаб. дарог, аэрапорт. 422 тыс. ж. (1970). Машынабудаванне і металаапрацоўка (пракат і сталь павышанай трываласці, папераробныя машыны, легкавыя аўтамабілі, абсталяванне для нафтаздабыўной прамысл., дарожныя і спартыўныя матацыклы, высокадакладныя станкі, рэдуктары, шарыкападшыпнікі і інш.). Найб. з-ды: «Нафтамаш», «Цяжкапермаш», радыёзавод, аўтазавод, механічны (выпускае паляўнічыя і спартыўныя стрэльбы). Прамысл. буд. матэрыялаў (домабуд. камбінат, з-д зборнага жалезабетону, керамічных блокаў, камбінат ячэйкавага бетону і цэглы). Лёгкая і харч. прамысловасць. ЦЭЦ. Газаправод Мінібаева (Татарская АССР) — І. Ін-ты: с.-г., механічны, мед., Удмурцкі пед.; 5 сярэдніх спец. навуч. устаноў. Удмурцкі НДІ гісторыі і л-ры. 3 тэатры, цырк. 2 музеі.

Узнік як пасёлак вакол жалезаапрацоўчага з-да (пабудаваны ў 1760). У Сялянскую вайну пад кіраўніцтвам Е. І. Пугачова захоплены паўстанцамі (1774). У 1902 створаны першыя с.-д. гурткі. У лют. 1917 бальшавікі ўзначалілі забастоўку амаль 40 тыс. чал. Сав. ўлада ўстаноўлена 27.10(9. 11).1917. З 1918 горад, з 1921 сталіца Воцкай а. в. (з 1932 Удмурцкай), з 1934 — Удмурцкай АССР.

Літ.: Севрюков О. В. Ижевск, Ижевск, 1969.

ІЗА... (ад грэч. ìsos роўны, аднолькавы), частка складаных слоў, якая азначае роўнасць, падабенства (напр., *ізаліні, ізатопы*).

ІЗААКТАН (2,2,4-трыметылпентан), $CH_3C(CH_3)_2CH_2CH(CH_3)CH_3$, насычаны вуглевадарод раду C_nH_{2n+2}, ізамер актану. Празрыстая бясколерная вадкасць з пахам прамагоннага бензіну, *t* пл. −107,38 °С, *t* кіп. 99,24 °С; шчыльн. 691,92 *кг/м*³.

І. адрозніваецца высокімі антыдэтанацыйнымі ўласцівасцямі, прынятымі за 100 адзінак (*н*-гептану за 0) шкалы актанавых лікаў АЛ (АЛ паліва лікава роўны колькасці І. ў эталоннай сумесі, якая мае антыдэтанацыйныя ўласцівасці, аднолькавыя з палівам, што даследуецца). У невялікіх колькасцях І. знаходзіцца ў нафтавых бензінах прамой гонкі. У прамысл. атрымліваюць *гідрагенізацыяй* дызабутылену над нікелевым ці медна-хромавым каталізатарам і *алкіліраваннем* ізабутану ізабутыленам у прысутнасці сернай к-ты, фтарыстага бору і інш. кіслотных каталізатараў. І. неабходны для забеспячэння карбюратарных рухавікоў высокаактанавымі *бензінамі*.

ІЗАБАРНЫ ПРАЦЭС (*ізa*...+грэч. bâros цяжар), тэрмадынамічны працэс, які адбываецца пры пастаянным ціску. Прыклады І. п.— большасць атмасферных з'яў, згаранне паліва ў топках, рэактыўных рухавіках і інш. Для *ідэальнага газу* пры І. п. аб'ём мяняецца прапарцыянальна *абсалютнай тэмпературы*. Гл. таксама *Тэрмадынаміка*.

ІЗАБЕЛІН, вёска ў Ваўкавыскім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Жданава. За 13 *км* на ПдУ ад Ваўкавыска, 102 *км* ад Гродна, на шашы Ваўкавыск — г. п. Ружаны. 527 ж., двароў 195 (1971). Майстэрня камбіната быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, вет. пункт, адда. сувязі, сталовая, 5 магазінаў. Ням.-фаш. захопнікі расстралялі 31 жыхара вёскі. 2 брацкія магілы 472 сав. воінаў, партызанаў, землякоў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ІЗАБЕЛІНА, вёска ў Астравецкім р-не Гродзенскай вобл., на р. Лоша. Цэнтр сельсавета і калгаса імя XXII партз'езду. За 6 *км* на У ад Астраўца, 256 *км* ад Гродна, 11 *км* ад чыг. ст. Гудагай. 140 ж., гасп. 46 (1970). Камбінат быт. абслугоўвання. Пач. школа, клуб, б-ка, адда. сувязі, магазін.

ІЗАІ (Ysaye) Эжэн (16.7.1858, Льеж — 12.5.1931), бельгійскі скрыпач, кампазітар, дырыжор і педагог. Вучань Г. Вяняўскага і А. В'ётана. У 1886—97 праф. Брусельскай кансерваторыі. Заснавальнік «Т-ва канцэртаў Ізаі» (1894). Канцэртаваў у многіх краінах, у т. л. ў Расіі (упершыню ў 1882). З твораў найб. вядомыя 6 санат для скрыпкі сола. У Бруселі наладжваліся міжнар. конкурсы скрыпачоў і піяністаў імя І. (першы ў 1937).

Літ.: Гинзбург Л. Эжен Изаи, М., 1959.

ІЗАЛЕЙЦЫН, $CH_3C_2H_5CH\,CH(NH_2)COOH$, α-аміна-β-этыл-β-метылпрапіёнавая кіслата, адна з незаменных *амінакіслот*. У жывёльным арганізме не сінтэзуецца. Уваходзіць у састаў бялкоў.

ІЗАЛІНІ (*ізa*...+лац. linea лінія), лініі, якія злучаюць на картах, разрэзах і графіках кропкі з роўнымі колькаснымі значэннямі пэўнай велічыні.

Найб. пашыраны: ізабары — злучаюць кропкі аднолькавага атмасфернага ціску і з'яўляюцца адным з сродкаў аналізу надвор'я і яго прадказання; ізабаты — злучаюць роўныя паказчыкі глыбіні, на фізічнай карце адлюстроўваюць рэльеф марскога дна (або дна возера); ізагаліны — адлюстроўваюць роўную салёнасць на дыяграмах марскіх гідралагічных разрэзаў; ізагіеты — злучаюць кропкі з аднолькавай колькасцю ападкаў, што выпадаюць за суткі, месяц, год; ізагіпсы (гарызанталі) — злучаюць кропкі з аднолькавай вышынёй адносна ўзр. м., даюць уяўленне пра рэльеф мясцовасці; ізагоны — лініі роўнага магн. схілення, а таксама аднолькавага напрамку ветру; ізаплёты — злучаюць аднолькавыя значэнні пэўных геафізічных велічынь, нанесеных на графік, дзе каардынатамі з'яўляюцца дзве другія велічыні (напр., час, глыбіня, вышыня і інш. геафізічныя велічыні), даюць магчымасць графічна паказаць залежнасць паміж трыма пераменнымі велічынямі; шырока выкарыстоўваюцца ў службе надвор'я; ізатахі — злучаюць кропкі з аднолькавай скорасцю цячэння вады на дыяграмах папярочнага разрэзу ракі і кропкі з аднолькавай скорасцю ветру (наз. таксама ізаанемоны); ізатэрмы — злучаюць паказчыкі сярэдняй т-ры паветра, вады і глебы; ізахроны — паказваюць адначасовасць надыходу якой-н. прыроднай з'явы; ізадэмы — злучаюць кропкі з аднолькавай шчыльнасцю насельніцтва.

Літ.: Салищев К. А. Картография, М., 1971; Составление и редактирование специальных карт, М., 1961.

ІЗАЛЯТАР ЭЛЕКТРЫЧНЫ, прыстасаванне для электрычнай ізаляцыі і механічнага мацавання частак эл. установак, прылад і апаратаў, якія знаходзяцца пад напружаннем. Складаюцца з уласна ізалятара і метал. дэталяў для яго мацавання. Робяцца з цвёрдых дыэлектрыкаў — керамікі электратэхнічнай, шкла, пластмасы, сіталаў і інш. (гл. *Ізаляцыйныя матэрыялы, Дыэлектрыкі*). Паверхня керамічных ізалятараў звычайна пакрываецца глазурай. І. э.— адна з найб. адказных частак эл. апаратаў і ўстановак; яны падлягаюць перыяд. праверкам і выпрабаванням.

Падзяляюцца: паводле канструкцыі — на лінейныя, апорныя і прахадныя; унутранай і знадворнай устаноўкі; паводле велічыні і частаты напружання — на нізкавольтавыя (да 500 *в*), высакавольтавыя і высокачастотныя. Лінейныя І. э. прызначаны падтрымліваць правады эл. ліній. Яны бываюць штыравыя для нізкага (рыс. 1, *а*) і высокага (рыс. 1, *б*) напружання і падвесныя (талеркавыя, рыс. 1, *в*) для высокага напружання. Для ліній 35 *кв* і вышэй выкарыстоўваюцца гірлянды падвесных ізалятараў. Апорныя І. э. ўжываюцца для жорсткага мацавання эл. шынаў, правадоў і асобных частак апаратаў. Бываюць штыравыя (звычайна для знадворнай устаноўкі) і фланцавыя (рыс. 1, *в*) для ўнутранай устаноўкі. Прахадныя І. э. прызначаны для ўводу вонкавых токаправодных частак эл. установак у памяшканні, апараты і інш. Для трансфарматараў, выключальнікаў і інш. апаратаў прахадныя І. э. павінны быць добра герметызаваныя. Таму пры напружанні 35 *кв* і вышэй ставяцца масланапоўненыя ізалятары — т. зв. кандэнсатарныя ўводы (рыс. 2). Высокачастотныя І. э. робяць з матэрыялаў з малымі дыэлектрычнымі стратамі (ультрафарфор, стэатыт). Выкарыстоўваюцца ў высокачастотных апаратах і ўстаноўках. Да І. э. адносяцца ролікі ўнутранай эл. праводкі, а таксама ізалявальныя трубкі, утулкі, шайбы і інш.



Рыс. 1. Асноўныя тыпы ізалятараў.



Рыс. 2. Кандэнсатарныя ўводы МТ-110, МТ-220.

Літ.: Синявский В. Н. Расчет, конструирование и испытания изоляторов высокого напряжения, М.—Л., 1965; Электротехнический справочник, 3 изд., т. 1—3 (кн. 1—2), М.—Л., 1962—66.

У. М. Сацута. Мінск.

ІЗАЛЯЦЫЙНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ электратэхнічныя, матэрыялы з высокім электрычным супраціўленнем, прызначаныя для ізалявання токаправодных частак электраўстановак. Належаць да класа *дыэлектрыкаў*. Асн. характарыстыкі: дыэлектрычная пранікальнасць, электраправоднасць, дыэлектрычныя траты, эл. трываласць, нагрэва- і марозаўстойлівасць, цеплаправоднасць, мех. трываласць, вільгацепаглынальнасць, растваральнасць. Падзяляюцца: па агрэгатным стане — на газападобныя, вадкія і цвёрдыя; па цепластойкасці — на класы Y, A, E, B, F, H, C; па хім. саставе — на арганічныя, неарганічныя і крэмнійарганічныя; па выкарыстанні — на нізкавольтавыя, высакавольтавыя і інш.

Газападобныя І. м.— паветра, вадарод, аргон, азот, гелій. Выкарыстоўваюцца ў кандэнсатарах, трансфарматарах, эл. машынах, газанапоўненых кабелях, электравакуумных прыладах і інш. Штучныя газападобныя І. м.— шасціфтарыстая сера (элегаз), дыхлордыфторметан (фрэон), перфторарганічныя газы (тэтрафторметан, гексафторэтан) і інш. Маюць большую эл. трываласць, чым інертныя газы. Ужываюцца ў эл. апаратах, кабелях паасобку або ў сумесі з паветрам. Вадкія І. м. ўжываюцца для ахаладжэння, узмацнення цвёрдай ізаляцыі эл.

апаратаў і кабеляў, для гашэння дугі ў выключальніках. Падзяляюцца на мінеральныя (трансфарматарнае, кандэнсатарнае, кабельнае масла); раслінныя (рыцына, ільняныя, тунгавыя алеі, ідуць на ўтварэнне электраізаляцыйных плёнак); сінтэтычныя (савол, саўтол, крэмнійарганічныя і фтораргані́чныя злучэнні). Апошнія ідуць на лакі; саволам і саўтолам замяняюць трансфарматарнае масла ў пажаранебяспечных установах. З цвёрдых І. м. найбольш пашыраны арганічныя: лакі і смолы (прыродныя — шэлак, каніфоль, бітумы; штучныя — гліфталевыя, эпаксідныя, полівінілавыя, полісіцірол, поліэтылен і інш.); матэрыялы на аснове цэлюлозы (папера, кардон, фібра і інш.); матэрыялы на аснове каўчуку (натуральны і сінт. каўчук, гума, эбаніт, эскапон) і пластмасы (карбаліт, бакеліт, тэксталіт, гетынакс і інш.). Цвёрдыя неарганічныя І. м. бываюць прыродныя (кварц, слюда, азбест) і штучныя (кераміка, фарфор, шкло, шкловалакно, шклотканіна і матэрыялы на аснове слюды — міканіт, мікалекс, мікафолій і інш.). Вызначаюцца высокай цеплаўстойлівасцю і эл. трываласцю. Ідуць на выраб *ізалятараў электрычных* і інш. Крэмнійарганічныя І. м.— смолы, лакі, гумы, кампаўнды, шклотканіна, пластмасы і інш. на крэмнійарганічнай аснове. Вызначаюцца высокай цеплаўстойлівасцю. Сінтэзам палімераў атрымліваюць новыя матэрыялы з высокімі дыэлектрычнымі і мех. ўласцівасцямі (напр., сіталы, шклофарфор), якія ўкараняюцца ў эл.-тэхн. прамысловасці.

І. м. выкарыстоўваюцца ў эл.-тэхн. будаўніцтве (эл. станцыі, падстанцыі, лініі электрапередач), пры вырабе трансфарматараў (Мінскі электратэхнічны завод), кабельнай прадукцыі (з-д «Гомелькабель»), ізаляваных аўтамаб. правадоў (з-д «Аўтапровад», Шчучын), быт. эл.-прылад (Лідскі з-д эл.-вырабаў).

Літ.: Тиняков Н. А. Новые материалы в электроэнергетике, Мн., 1963; Богородицкий Н. П., Пасынков В. В. и Тареев Б. М. Электротехнические материалы, 5 изд., Л., 1969; Антов П. С. и Хомяков М. В. Химические материалы в электрохозяйстве. М., 1969; Дроздов Н. Г. и Никулин Н. В. Электроматериаловедение, 3 изд., М., 1968. *А. М. Дарафейчык.* Гродна.

ІЗАМАРФІЗМ у матэматыцы (*іза...*+ грэч. morphḗ форма), узаемаадназначнае адлюстраванне матэм. сістэм або структур (мностваў з зададзенымі на іх некаторымі аперацыямі і адносінамі), якое захоўвае гэтыя аперацыі і адносіны.

Напр., сістэмы A і B з аперацыямі адпаведна $F_i(x_1, x_2, ..., x_{n_i})$ і $G_i(y_1, y_2, ..., y_{n_i})$; $i=1,2, ..., m$, ізаморфныя, калі існуе такое *адлюстраванне* φ: $A \to B$, што $\varphi(F_i(x_1, x_2, ..., x_{n_i})) = G_i(\varphi(x_1), \varphi(x_2), ..., \varphi(x_{n_i}))$ і аналагічныя адносіны справядлівы для адваротнага адлюстравання φ^{-1}. З абстрактнага пункту гледжання вывучэнне ўласцівасцей зададзенай матэм. сістэмы раўназначна вывучэнню ўласцівасцей усіх ізаморфных ёй матэм. сістэм. І. выяўляе універсальнасць матэм. метадаў, іх незалежнасць ад прыроды аб'ектаў, якія даследуюцца. Упершыню паняцце І. узнікла ў пач. 19 ст. ў тэорыі груп, потым у іншых алг. сістэмах; з пач. 20 ст. яно выкарыстоўваецца ва ўсіх раздзелах матэматыкі.

Літ.: Мальцев А. И. Алгебраические системы, М., 1970; Бурбаки Н. Начала математики, пер. с франц., ч. 1, кн. 1, М., 1965.

У. П. Платонаў. Мінск.

ІЗАМАРФІЗМ у хіміі, уласцівасць атамаў, іонаў ці малекул замяшчаць адзін аднаго ў крышталях (часцінка на часцінку). Неабходныя ўмовы магчымасці І.: аб'ёмы часцінак, якія замяшчаюць адна адну, павінны быць амаль аднолькавыя (адрозненне не больш як на 15%); часцінкі павінны быць здольныя да ўтварэння блізкай па характары тыпу хім. сувязі. Пры ўтварэнні цвёрдых растворaў І. праяўляецца ў замене малекулы на малекулу, падобную і па форме.

У выніку І. ўтвараюцца крышталі пераменнага саставу. Пры дасканалым І. яны ўтвараюць бесперапынны рад, пры недасканалым — абмежаваны. Адрозніваюць ізавалентны і гетэравалентны І. Пры ізавалентным у крышталічнай структуры замяшчаюцца іоны аднолькавай валентнасці, з блізкімі ўласцівасцямі і памерамі (напр., $Mg^{2+} \to Fe^{2+}$). Лік структурных адзінак пры ізавалентным І. захоўваецца. Пры гетэравалентным І. іон заменьваецца роўнавялікімі, але інш. валентнасці. Лік структурных адзінак можа мяняцца (напр., $3Mg^{2+} \to 2Al^{3+}$). І. залежыць ад уласцівасцей іонаў і атамаў і ад умоў вонкавага асяроддзя (канцэнтрацыі іонаў, т-ры і ціску). Пашыраны слрод многіх груп мінералаў (плагіяклазаў, піраксенаў, слюдаў, сульфідаў і інш.), што вызначае складанасць іх хім. саставу і мноства разнавіднасцей.

Літ.: Бокий Г. Б. Кристаллохимия, 2 изд., М., 1960; Лазаренко Е. К. Курс минералогии, 2 изд., М., 1971; Сауков А. А. Геохимия, М., 1966.

ІЗАМАРФІЗМ І ГОМАМАРФІЗМ у логіцы (*іза...*+грэч. morphḗ форма, hómois падобны+ +morphḗ), паняцці, якія характарызуюць у логіцы адносіны структур аб'ектаў, сістэм, вобразаў і інш.

Сістэмы ізаморфныя, калі кожнаму элементу адной з іх або кожнай аперацыі (сувязі) у адной сістэме адпавядае элемент, аперацыя (сувязь) у другой, і наадварот; калі адпаведнасць адназначная толькі ў адзін бок, сістэмы гамаморфныя. Паняцці І. і г. цесна звязаныя з паняццем *мадэляванне*.

ІЗАМЕРА́ЗЫ (*іза...*+ грэч. meros доля, частка), ферменты, якія каталізуюць абарачальнае ператварэнне некат. арганічных рэчываў у іх ізамеры (напр., фосфагліцэрынавы альдэгід у фосфадыгідраксіацэтон).

Літ.: Гл. пры арт. *Ферменты.*

ІЗАМЕРЫЯ ў хіміі (*іза...*+грэч. meros доля, частка), з'ява існавання хім. злучэнняў аднолькавага колькаснага і якаснага саставу, але з рознымі фізічнымі і хімічнымі ўласцівасцямі. Такія злучэнні наз. ізамерамі. І. ўласціва неарган. і арган. рэчывам, з'яўляецца адной з прычын разнастайнасці і шматлікасці хім. злучэнняў.

Адрозніваюць І. прасторавую (стэрэаізамерыю) і структурную. Прасторавая І. абумоўлена розным размяшчэннем атамаў у прасторы пры аднолькавай паслядоўнасці іх сувязі ў малекуле. Да яе належыць *ізамерыя аптычная* і І. геаметрычная (гл. *Стэрэахімія*). Структурная І. залежыць ад паслядоўнасці і парадку сувязі атамаў у малекуле і раздзяляецца на І. шклета, І. становішча і інш. У арган. злучэннях І. шклета залежыць ад паслядоўнасці сувязі вуглярод ных атамаў, што ўтвараюць шклет малекулы. Напр., для насычаных вуглевадародаў гамалагічнага раду C_nH_{2n+2} І. шклета магчыма, пачынаючы з бутану C_4H_{10}, для якога існуе 2 ізамеры: *н*-бутан $CH_3-CH_2-CH_2-CH_3$ і ізабутан $CH_3>CHCH_3$. Колькасць ізамераў хутка расце з павелічэннем колькасці вуглярод ных атамаў шклета, напр. для C_4H_{10} іх 2, а для $C_{10}H_{22}$ — 75. І. становішча залежыць ад размяшчэння атамаў ці функцыянальных груп (груп атамаў), што замяшчаюць атамы вадароду ў рэчывах з аднолькавым вуглярод ным шклетам. Структурныя ізамеры могуць адрознівацца характарам функцыянальных груп (напр., ацэтон $CH_3-CO-CH_3$, прапіёнавы альдэгід CH_3-CH_2-CHO) і парадкам сувязей вуглярод ных атамаў у ланцугу (напр., этылавы спірт CH_3-CH_2-OH, дыметылавы эфір CH_3-O-CH_3). Асобны выпадак структурнай І.— *таўтамерыя* (раўнаважная, дынамічная І.): існаванне рэчыва ў дзвюх ці больш ізамерных формах, якія розняцца функцыянальнымі групамі і лёгка пераходзяць адна ў адну да наступлення раўнавагі.

Літ.: Несмеянов А. Н. и Несмеянов Н. А. Начала органической химии, кн. 1—2, М., 1969—70; Терентьев А. П. и Потапов В. М. Основы стереохимии, М.— Л., 1964; Илиел Э. Стереохимия соединений углерода, пер. с англ., М., 1965. *Л. С. Станішэўскі.* Мінск.

ІЗАМЕРЫЯ АПТЫЧНАЯ, з'ява, абумоўленая прасторавай асіметрыяй малекул, выяўляецца ў адольнасці паварочваць плоскасць палярызацыі святла. Уласціва злучэнням, дзе ёсць т. зв. асіметрычны атам (звязаны з 4 рознымі атамамі ці групамі атамаў), і рэчывам з асіметрычнай будовай малекул.

Злучэнні з адным асіметрычным атамам існуюць толькі ў дзвюх структурна стэрэаізамерных формах, якія не маюць плоскасці сіметрыі і адносяцца адна да адной як несіметрычны прадмет да свайго люстранога вобразу. Такія ізамеры наз. антыподамі. Яны маюць аднолькавыя фіз. і хім. ўласцівасці, але адзін з іх паварочвае плоскасць палярызацыі святла ўлева ((−)-форма), а другі на такі ж вугал управа ((+)-форма). Перамена месцамі любых двух замяшчальнікаў у асіметрычнага атама прыводзіць да *інверсіі* — утварэння антыподнай канфігурацыі (напр., *Вальдэнаўскае ператварэнне*). Пры сінтэзах, калі ўзнікае асіметрычны атам вугляроду ў малекуле, утвараецца сумесь абодвух антыподаў — рацэмат. Расшчапленнем рацэматаў атрымліваюць асобныя ізамеры. Тыповае злучэнне з адным асіметрычным атамам вугляроду — малочная к-та $CH_3-C^*H(OH)-COOH$ (C^* — асіметрычны атам вугляроду), для якой вядомы аптычна актыўныя (±)-формы і неактыўная форма — рацэмат. Калі ў малекуле n асіметрычных атамаў, злучэнне мае 2^n ізамераў. Пры паўнасці аднолькавых замяшчальнікаў вакол двух асіметрычных атамаў колькасць магчымых аптычных ізамераў меншае, таму што ў малекуле існуе плоскасць сіметрыі. Гл. таксама *Аптычная актыўнасць, Вярчэнне плоскасці палярызацыі, Стэрэахімія, Вінныя кіслоты.*

Літ.: Гл. пры арт. *Ізамерыя.*

Л. С. Станішэўскі. Мінск.

ІЗАМЕРЫЯ АТАМНЫХ ЯДРАЎ (ядзерная ізамерыя), з'ява існавання розных фізічных уласцівасцей (перыядаў паўраспаду і інш.) у атамных ядрах з аднолькавымі ат. нумарамі (Z) і масавымі лікамі (A).

Эксперыментальна выяўлена ў 1921 нам. вуч. О. Ганам, даследавана ў 1935 І. В. Курчатавым з супрацоўнікамі. Тлумачыцца І. а. я. наяўнасцю ў некат. ядрах метастабільных (ізамерных) станаў, г. зн. станаў з адносна вялікім часам жыцця (ад 10^{-10} сек да некалькіх гадоў). Метастабільнасць стану абумоўлена малой верагоднасцю узбуджэння і адрозненнем моманту колькасці руху на некалькі адзінак ад адпаведнай велічыні для асноўнага стану (гл. *Адбору правілы*). Пры паўнасці ў атаме некалькіх метастабільных станаў І. а. я. называецца шматразовай. Атамныя ядры, якія знаходзяцца ў асноўным і ізамерным станах, наз. асноўным і верхнім ізамерамі. Асноўныя ізамеры ў большасці радыеактыўныя. Верхнія ізамеры ператвараюцца ў асноўныя (пры гама-выпрамяненні ці вылучэнні электронаў унутранай канверсіі) або ў ядры сусветніх па табліцы Мендзялеева атамаў (пры бэта-распадзе ці пры К-захопе).

Літ.: Маляров В. В. Основы теории атомного ядра, 2 изд., М., 1967. *Э. А. Рудак.* Мінск.

ІЗАПРЭН (2-метылбутадыен-1,3), $CH_2=C(CH_3)-CH=CH_2$, ненасычаны вуглевадарод раду C_nH_{2n-2}. Бясколерная вадкасць з t пл. −146 °С, t кіп. 34 °С, шчыльн. 681 *кг/м*³. Належыць да *дыенавых вуглевадародаў*. Здольны да рэакцый далучэння і палімерызацыі.

Упершыню атрыманы *піролізам* натуральнага каўчуку і гутаперчы. У прамысл. атрымліваюць:

каталітычным дэгідраваннем ізапентану і ізаамілену; раскладаннем 4,4-дыметылдыаксану-1,3, атрыманага кандэнсацыяй ізабутылену з фармальдэгідам пры наяўнасці каталізатара і інш. метадамі. Сыравінай для І. служаць спадарожныя нафтавыя газы і газы нафтаперапрацоўкі. Выкарыстоўваюць І. у вытв. сінт. каўчуку як самастойна (напр., *ізапрэнавага каўчуку*), так і ў сумесі з інш. манамерамі (напр., бутылкаўчуку).

ІЗАПРЭНАВЫ КАЎЧУК (1,4-цыс-поліізапрэн), арганічнае рэчыва, палімер *ізапрэну* $(C_5H_8)_n$. Бывае натуральны (НК) і сінтэтычны (СК).

Натуральны здабываюць з млечнага соку бразільскай гевеі. Вядомы ў Еўропе з 15 ст. Больш пашыраны сінтэт. І. к. СК, практычна раўнацэнны па фіз.-хім. і тэхнал. ўласцівасцях натуральнаму (мае 98% 1,4-цыс-звенняў), упершыню атрыманы ў 50-х г. 20 ст. сав. вучоным А. А. Каратковым. Сінтэт. І. к. бывае розных структуры (СКІ, СКІ-3, карал, амерыпол Эс-Эн і інш.). Можна атрымаць палімер са структурай *гутаперчы*. І. к.— лепшы з каўчукаў агульнага прызначэння (гл. *Гума*), шырока ўжываецца ва ўсіх галінах тэхнікі і ў быце.

Літ.: Гл. пры арт. *Каўчук.*

В. П. Мардыкін. Мінск.

ІЗАСТАЗІЯ, гл. ў арт. *Тэктанічныя гіпотэзы.*

ІЗАТАПІЧНЫ СПІН, велічыня, якая вызначае колькасць розных зарадавых станаў адрона ці сістэмы адронаў.

Аператар І. с. дзейнічае ў ізатапічнай прасторы і нагадвае аператар *спіна* ў квантавай механіцы. Сукупнасць зарадавых станаў адрона ўтварае т. зв. ізатапічны (зарадавы) мультыплет (гл. *Адроны*). Паміж эл. зарадам Q, велічынёй трэцяй праекцыі вектара І. с. T_3, дзіўнасцю S (гл. *Гіпероны*) і барыённым лікам B (гл. *Барыёны*) для кожнага мультыплета існуе сувязь $Q = T_3 + \frac{1}{2}(S+B)$. Напр., нуклону ($B=1$, $S=0$) адпавядае $T_3 = Q - \frac{1}{2}$, што дае $T_3 = \frac{1}{2}$ для пратона ($Q=1$) і $T_3 = -\frac{1}{2}$ для нейтрона ($Q=0$), т. ч. нуклон мае два зарадавыя станы (ізадублет). Велічыня поўнага І. с. сістэмы захоўваецца ў моцных (ядзерных) узаемадзеяннях (прынцып зарадавай незалежнасці), а велічыня T_3 — у эл.-маги. узаемадзеяннях.

Літ.: Ферми Э. Лекции о π-мезонах и нуклонах, пер. с англ., М., 1956. *І. С. Саўнкевіч.* Мінск.

ІЗАТО́ПНЫЯ ІНДЫКА́ТАРЫ (мечаныя атамы), рэчывы, у якіх знаходзіцца пэўная колькасць стабільных ці радыеактыўных *ізатопаў* і якія выкарыстоўваюцца для маркіроўкі сумесі малекул і розных аб'ектаў пры даследаванні колькасці, пераміяшчэння элементаў і злучэнняў у хім., тэхнал., фізіялагічных і інш. працэсах.

Метад І. і. заснаваны на падобнасці ўласцівасцей ізатопаў хім. элемента, таму ўвод І. і. практычна не уплывае на звычайныя фіз., хім., біял. і інш. працэсы (калі з І. і. не уводзіцца занадта вялікая радыеактыўнасць). Для рэгістрацыі радыеактыўных І. і. (гл. *Ізамерыя атамных ядраў*) карыстаюцца *лічыльнікамі заражаных часцінак, іанізацыйнымі камерамі* і інш. дэтэктарамі радыеактыўнасці. Нерадыеактыўныя (стабільныя) І. і. рэгіструюцца мас-спектрометрамі. І. і. шырока выкарыстоўваюцца ў хіміі, фізіцы, біялогіі, медыцыне, металургіі, нафтапрамысловасці і г. д.

Літ.: Баркан А. С. Радиоактивность и ее применение, Мн., 1956; Шлык А. А. Метод меченых атомов в изучении биосинтеза хлорофилла, Мн., 1956; Джагацпанян Р. В., Ромм Р. Ф. и Таточенко Л. К. Применение радиоактивных изотопов для контроля химических процессов, М., 1963.

В. І. Гапоненка. Мінск.

ІЗАТО́ПЫ (*іза...*+грэч. tópos месца), разнавіднасці атамаў аднаго і таго ж хім. элемента, якія маюць аднолькавы атамны нумар (Z), займаюць адно месца ў перыяд. сі-

стэме Мендзялеева і адрозніваюцца масавым лікам (*A*).

Магчымасць існавання І. прадказана ў канцы 19 ст. А. М. Бутлеравым, П. Шутцэнбергерам і У. Круксам; існаванне іх эксперым. пацверджана ў 1906. Абазначаюцца сімвалам хім. элемента з указаннем масавага ліку, напр. ^{90}К, ^{40}К. Пры адпаведнай будове электронных абалонак маюць розную структуру ат. ядраў (ядры адрозніваюцца лікам нейтронаў). Існуюць бэта-ўстойлівыя і бэта-радыеактыўныя І. (гл. *Бэта-распад*). Бэта-ўстойлівыя І. цяжкіх элементаў ($Z>83$) распадаюцца з вылучэннем *альфа-часцінак*. Большасць радыеактыўных І. атрымліваюць штучна ў ядзерных рэакцыях. Хім. элементы ў прыродзе — сумесі некалькіх І. І. выкарыстоўваюцца ў навук. даследаваннях, прамысл. кантролі, у аўтаматызацыі вытворчасці, у якасці мечаных атамаў (гл. *Ізатопныя індыкатары*), для кансервавання с.-г. прадуктаў, як крыніца радыеактыўнага выпромянення. І. маюць важнае значэнне пры вывучэнні гісторыі Зямлі і пошуках карысных выкапняў. Даследаванне адносін стабільных І. (цяжкага да лёгкага) шэрагу хім. элементаў дае магчымасць вызначыць перспектыўнасць тэрыторый на нафту і гаручыя газы, ступень метамарфізму горных парод, палеатэмпературу марскіх і прэснаводных басейнаў у мінулыя геал. эпохі, тыпы падземных водаў, умовы іх развіцця і інш. Выкарыстоўваюць І. для пошукаў хім. элементаў (берылію, бору, свінцу, радыю і інш.) і вызначэння ўзросту арган. рэштак, метэарытаў, узросту Зямлі і інш. лябесных цел. Гл. таксама *Геалагічнае летазлічэнне*.

Літ.: Селинов И. П. Изотопы. т. 1—3. М., 1970. *Э. А. Рудак, Г. У. Гурскі.* Мінск.

ІЗАТРАПІЯ (*ізa...*+грэч. tróros паварот, кірунак), аднолькавасць фіз. уласцівасцей цела, асяроддзя ці прасторы па ўсіх кірунках.

Характэрна рэчывам у аморфным стане, у адрозненне ад *анізатраніі*, уласцівай крышталям. Адпак І. адносна адных уласцівасцей можа спалучацца з анізатраніяй адносна іншых уласцівасцей. Напр., крышталі кубічнай сістэмы ізатропныя адносна аптычных і анізатропныя адносна механічных уласцівасцей.

ІЗАТЭРМІЧНЫ ПРАЦЭС (*ізa...*+грэч. thérmē цеплыня), тэрмадынамічны працэс, які адбываецца пры пастаяннай тэмпературы. Напр., кіпенне вадкасці пры пастаянным ціску, плаўленне крышталічных целаў і інш. Для *ідэальнага газу* ціск і аб'ём пры І. п. мяняюцца адваротна прапарцыянальна адзін аднаму. Гл. таксама *Тэрмадынаміка*.

ІЗАХОРНЫ ПРАЦЭС (*ізa...*+грэч. chōra занятая прастора), тэрмадынамічны працэс, які адбываецца пры пастаянным аб'ёме. Для *ідэальнага газу* пры І. п. ціск мяняецца прапарцыянальна *абсалютнай тэмпературы*. Гл. таксама *Тэрмадынаміка*.

ІЗАЧЫК Мікалай Георгіевіч [н. 28.3(10.4). 1901, Мінск], удзельнік грамадз. вайны, контрадмірал (1949). Чл. КПСС з 1918. Скончыў Ваенна-марскую акадэмію (1935). У Чырв. Арміі з мая 1919. Ваяваў на Усх. і Паўд. франтах супраць Калчака і Дзянікіна. З 1922 у ВМФ. З 1924 на парт.-паліт. рабоце ў флоце. У 1935—54 ва ўпраўленні ваенна-марскіх навуч. устаноў, нам. нач. Вышэйшага ваен.-марскога вучылішча, нач. Ленінградскага нахімаўскага ваен.-марскога вучылішча. Узнаг. ордэнам Леніна, 5 інш. ордэнамі, медалямі. Жыве ў Ленінградзе.

ІЗБІШЧА, вёска ў Лагойскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Перамога». За 57 *км* на ПнЗ ад Лагойска, 97 *км* ад Мінска, 27 *км* ад чыг. ст. Княгініна. 358 ж., двароў 96 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. і вет. пункты, адд. сувязі, магазін. У 1943 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі, загубілі 107 мірных жыхароў. 3 помнікі: на брацкай магіле 4 партызан, на 2 магілах сав. воінаў Айч. вайны.

«ИЗВЕ́СТИЯ АРМЕ́ЙСКОГО СОВЕ́ТА ДЕПУТА́ТОВ X АРМИИ», газета, якая выходзіла ў Маладзечне з 28.6(11.7).1917 да лют. 1918 на рус. мове.

Спачатку выдавалася Армейскім камітэтам 10-й арміі пад назвай «Голос X армии», прытрымлівалася эсэра-меншавіцкага кірунку. Нумары 101 і 102 ад 10(23) і 11(24).11.1917 выйшлі як органы Прэзідыума 3-га армейскага з'езду, на якім перамаглі бальшавікі. З 12(25).11.1917 бальшавіцкая газета пад назвай «Бюллетень Военно-революционного комитета X армии», з 1(14).1.1918 «Известия Армейского комитета X армии», з № 5 ад 6(19).1.1918 — «Известия Совета депутатов X армии», з № 6 ад 9(22).1.1918 «Известия армейского Совета депутатов X армии».

Газета разгарнула шырокую бальшавіцкую прапаганду сярод салдатаў, друкавала загады армейскага Савета 10-й арміі, дэкрэты Сав. ўрада, матэрыялы 1-й надзвычайнай армейскай канферэнцыі РСДРП(б), 3-га Усерасійскага з'езду Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў, паведамленні пра становішча на франтах і ў краіне. Апошні вядомы нумар ад 17.2.1918.

«ИЗВЕ́СТИЯ АРМЕ́ЙСКОГО СОВЕ́ТА СОЛДА́ТСКИХ ДЕПУТА́ТОВ III АРМИИ И ПО́ЛОЦКОГО СОВЕ́ТА РАБОЧИХ, СОЛДА́ТСКИХ И КРЕСТЬЯ́НСКИХ ДЕПУТА́ТОВ», бальшавіцкая газета, якая выходзіла ў Полацку з ліст. 1917 да лют. 1918 на рус. мове.

Да № 31 ад 25.12.1917 (7.1.1918) наз. «Известия Военно-революционного комитета III армии», з № 32 — «Известия армейского Совета солдатских депутатов III армии», з 3(16).1.1918 — «Известия армейского Совета солдатских депутатов III армии и Полоцкого Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов».

Выступала за ўмацаванне Сав. улады, заклікала рабочых і сялян абараняць сацыяліст. Радзіму. Змяшчала дэкрэты Сав. улады, загады і пратаколы пасяджэнняў Ваенна-рэвалюц. камітэта 3-й арміі, матэрыялы 3-га надзвычайнага з'езду 3-й арміі, паведамленні з франтоў, афіц. матэрыялы Полацкага Савета і інш. Апошні вядомы нумар ад 17.2.1918.

«ИЗВЕ́СТИЯ ВОЕ́ННО-РЕВОЛЮЦИО́ННОГО КОМИТЕ́ТА III АРМИИ», газета Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта 3-й арміі, якая выдавалася ў Полацку з ліст. да снеж. 1917 на рус. мове. З № 32 ад 29.12.1917 (11.1.1918) наз. «Известия армейского Совета солдатских депутатов III армии», ад 3(16).1.1918 — *«Известия армейского Совета солдатских депутатов III армии и Полоцкого Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов»*.

«ИЗВЕ́СТИЯ ВОЕ́ННО-РЕВОЛЮЦИО́ННОГО КОМИТЕ́ТА ГОРОДА ВИ́ТЕБСКА», першая назва газ. *«Віцебскі рабочы»* (№ 1—13, 1917).

«ИЗВЕ́СТИЯ ГОМЕЛЬСКОГО СОВЕ́ТА РАБО́ЧИХ, СОЛДА́ТСКИХ И КРЕСТЬЯ́НСКИХ ДЕПУТА́ТОВ», з 30.10(12.11).1917 да студз. 1918 назва газ. *«Гомельская праўда»*.

«ИЗВЕ́СТИЯ ГОМЕЛЬСКОГО СОВЕ́ТА РАБО́ЧИХ, СОЛДА́ТСКИХ И КРЕСТЬЯ́НСКИХ ДЕПУТА́ТОВ», эсэра-меншавіцкая газета, якая выдавалася ў Гомелі з сак. да кастр. 1917 на рус. мове. Да № 49 (укл.) ад 2.7.1917 наз. «Известия Гомельского Совета рабочих и солдатских депутатов». Падтрымлівала бурж. Часовы ўрад і яго курс на працяг імперыял. вайны, выступала супраць ленінскага лозунга аб перадачы ўсёй улады Саветам. З ліп. 1917 адкрыта стала на контррэвалюц. пазіцыі.

«ИЗВЕ́СТИЯ ЗАПА́ДНОЙ КОММУ́НЫ», скарочаная назва газ. «Известия исполнительного комитета Советов рабочих, крестьянских и солдатских депутатов Западной Коммуны» (з вер. 1918), «Известия исполнительных комитетов Советов рабочих, крестьянских и солдатских депутатов Западной Коммуны и г. Смоленска» (з кастр. 1918), якая ўжываецца ў публікацыях (гл. *«Западная Коммуна»*).

«ИЗВЕ́СТИЯ ИСПОЛКО́МА», якая выдавалася выканаўчым камітэтам Саветаў рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў Сенненскага пав. Магілёўскай губ. ў Сянне ў маі — ліп. 1918 на рус. мове. Друкавала афіц. матэрыялы Сав. ўрада, Заходняй Камуны, у склад якой уваходзіла і неакупаваная нам. інтэрвентамі частка Магілёўскай губ. (разам з Сянном), асвятляла мясцовае і міжнар. жыццё.

«ИЗВЕ́СТИЯ КЛИ́МОВИЧСКОГО ИСПОЛКО́МА СОВЕ́ТА КРЕСТЬЯ́НСКИХ И КРАСНОАРМЕ́ЙСКИХ ДЕПУТА́ТОВ», газета, якая выдавалася Клімавіцкім выканкомам Савета сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў у 1918 у Клімавічах Магілёўскай губ.

«ИЗВЕ́СТИЯ МИ́НСКОГО СОВЕ́ТА РАБО́ЧИХ И СОЛДА́ТСКИХ ДЕПУТА́ТОВ», газета, орган Мінскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Выдавалася ў Мінску з 5(18) сак. да кастр. 1917 тры разы на тыдзень на рус. мове. Назва № 1—2 «Известия Совета рабочих депутатов»; з № 3 да № 40 (укл.) — «Известия Совета рабочих и солдатских депутатов». У сак.— крас., калі большасць дэпутацкіх месцаў у Савеце была захоплена прадстаўнікамі згодніцкіх партый, газета мела эсэра-меншавіцкі кірунак. У выніку перавыбараў Савета ў маі — чэрвені 1917 большасць месцаў у Прэзідыуме Мінскага Савета атрымалі бальшавікі. Уплыў іх і ў Савеце і на газету мацнее. Газета друкавала матэрыялы, у якіх выкрывалася імперыяліст. палітыка Часовага ўрада. З вер. 1917 пасля новых перавыбараў Мінскага Савета газета цвёрда становіцца на бальшавіцкія пазіцыі. Выступала супраць імперыял. вайны, з'явілася трыбунаю прапаганды рэвалюц. ідэй сярод працоўных Беларусі і салдатаў Зах. фронту. Апошні вядомы нумар 76 ад 18(31).10.1917. Агульны сход Мінскага Савета ад 18(31).10.1917 вырашыў перайменаваць орган Саветаў у «Рабочий и солдат».

«ИЗВЕ́СТИЯ МОГИЛЕ́ВСКОГО ГУБЕ́РНСКОГО ИСПОЛНИ́ТЕЛЬНОГО КОМИТЕ́ТА СОВЕ́ТОВ КРЕСТЬЯ́НСКИХ, СОЛДА́ТСКИХ И РАБОЧИХ ДЕПУТА́ТОВ», газета, якая выходзіла ў Магілёве ў студз.— лют. 1918 на рус. мове. № 1—10 выйшлі пад назвай «Известия Могилевского Совета рабочих и солдатских депутатов». Друкавала пастановы Сав. ўрада, асвятляла мясц. жыццё, рэвалюц. рух за мяжой.

«ИЗВЕ́СТИЯ МОГИЛЕ́ВСКОГО ГУБЕ́РНСКОГО РЕВОЛЮЦИО́ННОГО КОМИТЕ́ТА», газета, якая выходзіла ў ліст.— снежні 1918 на рус. мове ў Магілёве пасля вызвалення горада ад ням. інтэрвентаў. Выступала за ўмацаванне Сав. улады, змяшчала пастановы Магілёўскага губ. рэвалюцыйнага к-та, пісала пра рэвалюц. рух за мяжой. Апошні вядомы нумар ад 29.12.1918.

«ИЗВЕ́СТИЯ МОЗЫ́РСКОГО СОВЕ́ТА РАБО́ЧИХ И СОЛДА́ТСКИХ ДЕПУТА́ТОВ», газета, якая выдавалася ў Мазыры з 4(17).5.1917 да лют. 1918 на рус. мове. З № 27 [ад 15(28). 6.1917] да сярэдзіны вер. 1917 наз. «Известия Мозырского Совета рабочих и солдатских депутатов и Мозырского Совета крестьянских депутатов». Да Кастр. рэв. большасць дэпутацкіх месцаў у Мазырскім Савеце належала меншавікам і эсэрам, кірунак газеты — эсэра-меншавіцкі, згодніцкі. Друкавала ўказы і загады бурж. Часовага ўрада, пратаколы і рэзалюцыі Мазырскага Савета, выказвалася за скліканне Устаноўчага сходу, асвятляла мясц. жыццё. Усяго выйшла 150 нумароў. *М. А. Тарасаў.* Ленінград.

«ИЗВЕ́СТИЯ СОВЕ́ТА РАБО́ЧИХ, КРЕСТЬЯ́НСКИХ, БАТРА́ЦКИХ И КРАСНОАРМЕ́ЙСКИХ ДЕПУТА́ТОВ ОРША́НСКОГО У́ЕЗДА», газета, якая выдавалася ў Оршы з сак. 1918 на рус. мове. З 11.10.1918 да мая 1920 наз. «Набат».

«ИЗВЕ́СТИЯ СОВЕ́ТА РАБО́ЧИХ, СОЛДА́ТСКИХ И КРЕСТЬЯ́НСКИХ ДЕПУТА́ТОВ ОРША́НСКОГО РАЙО́НА», меншавіцка-эсэраўская газета, якая выдавалася ў Оршы з 1(14).5.1917 на рус. мове. Адлюстроўвала дробнабурж., згодніцкія погляды меншавікоў і эсэраў, якім да Кастр. рэв. ў Аршанскім Савеце належала большасць дэп. месцаў. Падтрымлівала палітыку бурж. Часовага ўрада, яго імкненне весці далей імперыял. вайну. Апошні вядомы нумар ад 26.6(9.7).1917.

«ИЗВЕ́СТИЯ СОВЕ́ТОВ ДЕПУТА́ТОВ ТРУДЯЩИХСЯ СССР», штодзённая грамадска-палітычная газета, якая выдаецца Прэзідыумам Вярх. Савета СССР. Асвятляе пытанні грамадска-паліт., эканам. і культурнага жыцця краіны, дасягненні сав. народа ў камуніст. буд-ве, міжнар. падзеі. Тыраж газеты друкуецца, акрамя Масквы, у буйных гарадах краіны, у т. л. ў Мінску. З 1.6.1960 маскоўскі выпуск газ. пераведзены на вячэрні. Мае шырокую сетку карэспандэнтаў у СССР і за мяжою.

Пачала выходзіць 28.2(13.3).1917 у Петраградзе пад назвай «Известия Петроградского Совета рабочих и солдатских депутатов»; з 1(14).8.1917 наз. «Известия Центрального Исполнительного комитета и Петроградского Совета рабочих и солдатских депутатов». Паліт. кірунак газеты да вер. 1917 вызначаўся складам Петраградскага Савета, большасць дэпутацкіх месцаў у якім належала меншa-

вікам і эсэрам. З 27.10(9.11).1917 бальшавіцкая газета, орган Усерасійскага цэнтр. выканаўчага к-та і Петраградскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. У газеце былі змешчаны першыя дэкрэты Сав. ўрада — аб міры і аб зямлі, іншыя гістар. дакументы Сав. улады. З 3.3.1918 выдаецца ў Маскве пад назвай «Известия Всероссийского Центрального Исполнительного комитета Советов крестьянских, рабочих, солдатских и казачьих депутатов»; з 22.6.1918 — орган ВЦВК і Маск. Савета; з 14.7.1923 — орган ЦВК СССР і ВЦВК. Пад назвай «Известия Советов депутатов трудящихся СССР» выходзіць з 26.1.1938. Узнаг. ордэнам Леніна (1967) і ордэнам Прац. Чырв. Сцяга (1949).

«ИЗВЕСТИЯ УЕЗДНОГО ИСПОЛНИТЕЛЬНОГО КОМИТЕТА СОВЕТОВ РАБОЧИХ, КРЕСТЬЯНСКИХ И КРАСНОАРМЕЙСКИХ ДЕПУТАТОВ СЕННЕНСКОГО УЕЗДА МОГИЛЕВСКОЙ ГУБЕРНИИ», газета, якая выдавалася на рус. мове ў Сянне з жн. 1918 да студз. 1919. Яе папярэдніца — газ. *«Известия исполкома»*. З 16.1.1919 да ліст. 1922 наз. «Факел».

ІЗГОІ (ад «гаіць» — жыць, зажыўляць), 1) людзі ў Ст. Русі 11—12 ст., якія па розных абставінах выбылі з свайго былога сацыяльнага асяроддзя і знаходзіліся пад апекаю царквы (збяднелыя купцы, адхіленыя княжычы, халопы, якія выкупіліся, і інш.). 2) Людзі, адхіленыя гр-вам, адшчапенцы.

Літ.: Греков Б. Д. Крестьяне на Руси с древнейших времен до XVII в., кн. 1, 2 изд., М., 1952.

ІЗЛЕДЗЬ, рака, левы прыток р. Волкі (бас. Нёмана). Даўж. 30 *км*. Цячэ ў Валожынскім, Стаўбцоўскім р-нах Мінскай і Іўеўскім р-не Гродзенскай абл. Вадазбор (403 *км*²) — у вярхоўі слабаўзгорыстая, на астатнім працягу плоская, забалочаная раўніна, перасечаная асушальнымі канавамі. Прыток р. Каменка (справа). Жыўленне мяшанае. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 2 *м*³/*сек*.

ІЗМАЙЛАВА Галія Баязетаўна (н. 12.2.1925, Томск), узбекская савецкая балерына. Нар. арт. СССР (1962). Скончыла балетную школу (1941) і рэжысёрскі ф-т тэатр.-маст. ін-та (1958) у Ташкенце. З 1941 салістка т-ра оперы і балета імя Наваі. З роляў: Семург («Ак-Біляк» С. Васіленкі), Юлдуз («Мара» І. Акбарава), Адэта-Адылія («Лебядзіная возера» П. Чайкоўскага), Жызэль («Жызэль» А. Адана). Паставіла шэраг спектакляў. Вядомая выканаўца танцаў народаў Азіі. Дзярж. прэмія СССР 1950. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, ордэнам «Знак Пашаны».

ІЗМАК (Немак), возера ў бас. р. Палата, правага прытока Зах. Дзвіны, у Полацкім р-не Віцебскай вобл. Пл. 1,25 *км*². Даўж. 1,8 *км*, найб. шыр. 1,1 *км*, сярэдняя 0,7 *км*, найб. глыб. 5 *м*. Катлавіна круглявая. Берагі забалочаныя, парослыя хмызняком. І. зарастае; праточнае, праз яго працякае р. Палата. Водзяцца лешч, шчупак, акунь, плотка, язь.

ІЗОТАЎ Мікіта Аляксеевіч (9.2.1902, сяло Малая Драгунка Кромскага пав. Арлоўскай губ.— 14.1.1951), шахцёр, адзін з пачынальнікаў стаханаўскага руху ў Данбасе. Чл. КПСС з 1936. У 1932—33 арганізаваў на шахце ўчастак-школу для павышэння кваліфікацыі маладых забойшчыкаў (т. зв. ізотаўская школа). У 1935—37 вучыўся ў Прамысл. акадэміі ў Маскве. З 1937 на кіруючых пасадах у вуг. прамысл. Дэп. Вярх. Савета СССР 1-га скл. На XVIII з'ездзе КПСС выбраны чл. Цэнтр. рэвізійнай камісіі. Аўтар кнігі «Маё жыццё. Мая праца» (1934). Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.

ІЗРАІЛЬ (Дзяржава Ізраіль), на ўсх. узбярэжжы Міжземнага м. Пл. (паводле рашэння ААН у 1947) 14 тыс. *км*². На 5.6.1967 І. кантраляваў тэр. ў 20,7 тыс. *км*². Нас. 2822 тыс. чал. (1969). Сталіца Тэль-Авіў. І. падзяляецца на 6 дыстрыктаў (акруг). І.— бурж. рэспубліка. Адзінай канстытуцыі няма. Асн. законамі лічацца: Пераходны закон 1949, наз. Малой канстытуцыяй; Закон аб вяртанні 1950; Закон аб грамадзянстве 1952 і інш. На чале дзяржавы прэзідэнт, які выбіраецца на 5 гадоў. Вышэйшы заканадаўчы орган — кнесет (аднапалатны парламент), які выбіраецца на 4 гады. Выканаўчы орган — урад.



Прырода. Асн. частка тэр. І.—нагор'е выш. 600—700 *м*. Паўночная, найб. высокая ч. нагор'я наз. плато Галілея (тут найвыш. пункт краіны г. Мейрон, 1208 *м*). На Пд паўпустыннае плато Негеў, якое на У апускаецца да вялізнага грабена Эль-Гор. Самая нізкая ч. ўпадзіны Эль-Гор занята Мёртвым м. Уздоўж Міжземнага м. раўнінная паласа. Клімат субтрапічны міжземнаморскі з сухім летам. Сухасць паветра большая з З на У і з Пн на Пд. Сярэдняя т-ра студз. 7; 13, ліп. 23; 30 °С. Ападкаў 500—700 *мм* за год. Гал. рака Іардан (118 *км* на тэр. І.). Найб. азёры: Мёртвае м. (280 *км*² у межах І.) і Тыверыядскае.

Насельніцтва. Асн. насельніцтва яўрэі (87,5%); большасць з іх імігранты. Жывуць арабы. Дзярж. мова іўрыт (стараж.-яўрэйская). Дзярж. рэлігія іудаізм; ёсць мусульмане, хрысціяне і інш. Сярэдняя шчыльн. 135 чал. на 1 *км*². Гарадскога нас. 80%. Найб. гарады (тыс. ж., 1968): Тэль-Авіў — 838, Хайфа — 448.

Гістарычны нарыс. Стварэнне дзяржавы І. абвешчана 14.5.1948 на падставе рашэння Ген. Асамблеі ААН ад 29.11.1947, якое адмяніла мандат Вялікабрытаніі на *Палесціну* і прадугледжвала падзел У выніку араба-ізраільскай вайны 1948—49 (пачала-

Пустыня Негеў.




ІЗРАІЛЬ
Маштаб 1:2 500 000
25 0 25 50 км
Тэрыторыя арабскай дзяржавы
Дэмаркацыйная лінія, вызначаная пагадненнем аб перамір'і у 1949 г.
Заўвага. Граніцы дзяржавы Ізраіль паказаны ў адпаведнасці з рэзалюцыяй Генеральнай Асамблеі ААН ад 29 лістапада 1947 года.
Міжземнае м.
Іардан
Мёртвае м.
Чырвонае м.
ЕГІПЕТ
ЛІВАН
ІРАК
ІЗРАІЛЬ
ІЗРАІЛЬ
ІЗРАІЛЬ

правасацыялістычныя МАПАЙ і РАФІ (апошняя засн. ў 1965), а таксама дробнабурж. Ахдут-Гаавода-Паалей-Цыён (засн. ў 1954) зліліся ў т. зв. Аб'яднаную рабочую партыю (МАІ). У студз. 1969 да блоку далучылася ўплывовая бурж. партыя МАПАМ. Аднак гэта не спыніла барацьбы ўнутры пануючай групоўкі. Крайне правыя элементы выступаюць за анексію ўсіх акупаваных араб. тэрыторый, за ўмацаванне адносін з міжнар. рэакцыяй. Агрэс. знешняя і рэакц. ўнутраная палітыка ўрада выклікае нездаволенасць розных колаў насельніцтва краіны. У 1967—71 у многіх гарадах адбыліся дэманстрацыі пратэсту. Барацьбу працоўных супраць імперыялізму, за дэмакратыю, сац. прагрэс. і справядлівы мір на Б. Усходзе ўзначальвае КПІ.

Гаспадарка. Эканоміка развіваецца пераважна за кошт прытоку сродкаў ад сіянісцкіх арг-цый, кантралюецца манаполіямі ЗША, Канады, Вялікабрытаніі і ФРГ. Прамысловасць базіруецца на перапрацоўцы імпартнай сыравіны і паўфабрыкатаў, энергетыка — на імпартным паліве. Здабыча нафты (130 тыс. *т*, 1968), фасфатаў (670 тыс. *т*), прыроднага газу (142 млн. $м^3$). З вады Мёртвага м. здабываюць калійныя солі (600 тыс. *т*, 1968), спажыўную соль, магній, бром. Выпрацоўка эл. энергіі ў 1969 6,0 млрд. *квт·гадз.* Прамысловасць хім. (штучнае валакно, гумавыя вырабы, фарбы, мінер. ўгнаенні), харч., алмазаапрацоўчая (на імпартнай сыравіне), тэкст., швейная. Ёсць прадпрыемствы электратэхн., электронная, машынабуд. і аўтамабілебуд. прамысловасці. За апошнія гады хутка развіваецца ваен. прамысловасць. Пасля кароткага эканам. ўздыму, выкліканага ростам ваен. заказаў з сярэдзіны 1967, у краіне зноў нарастаюць крызісныя з'явы. Павелічэнне ваенных расходаў вядзе да рэзкага росту знешняй запазычанасці (2,1 млрд. дол., 1969), расходавання валютных рэзерваў, інфляцыі. Каля $^3/_5$ усіх прамысл. прадпрыемстваў у Хайфе і Тэль-Авіве. Пераважаюць невял. прадпрыемствы паўсаматужнага і саматужнага тыпу. Найб. заводы: сталеліцейны і сталепракатны ў г. Ака, аўтазборачны і нафтаперапр. ў Хайфе.

Хімічны завод
на паўднёвым беразе Мёртвага мора.



У с. гасп. занята 12% самадзейнага насельніцтва. У 1968 апрацоўвалася 422,5 тыс. *га* зямлі, з іх 169 тыс. *га* арашальных. Асн. с.-г. культура — цытрусавыя (1292 тыс. *т*, 1968). Вырошчваюць вінаград, яблыкі, фінікі, абрыкосы, бананы, слівы, міндаль. Сеюць тэхн. культуры (цукр. буракі, земляны арэх, бавоўнік), збожжавыя (пшаніцу, ячмень, рыс, проса, кукурузу). У 1968 (тыс. галоў) у яўрэйскіх гасп.: буйн. раг. жывёлы 205,6, авечак 121,5, коз 28,5; у арабскіх гасп.: буйн. раг. жывёлы 26,8, авечак 75, коз 112,2. Птушкагадоўля (6,3 млн. курэй-нясушак) у яўрэйскіх гасп. Даўж. чыгунак 734 *км*, аўтамаб. дарог 3,9 тыс. *км*. Нафтаправоды Эйлат — Хайфа і Эйлат — Ашкелон. Танаж гандл. флоту 769 тыс. бр. рэг. *т* (1969). Гал. порты Хайфа, Тэль-Авіў, Эйлат. І. вывозіць: шліфаваныя алмазы (37% экспарту), цытрусавыя (16%), кансерваваную садавіну, тэкст. валокны, пражу і інш. Прывозіць: неапрацаваныя алмазы, харч. тавары, бавоўну, нафту, каўчук, хімікаліі, трансп. сродкі, абсталяванне. Асн. гандл. сувязі з ЗША, Вялікабрытаніяй, ФРГ. На іх долю прыпадае каля 46% экспарту і 54% імпарту. У 1968 экспарт склаў 603 млн., імпарт 1061 млн. дол. Грашовая адзінка — ізраільскі фунт. Ваен. абставіны, якія склаліся пасля чэрвеньскай агрэсіі 1967, пагоршылі становішча працоўных, асабліва арабаў, а таксама яўрэяў — выхадцаў з усх. краін. Рэзка павысіліся цэны, замарожваецца заработная плата, у некалькі разоў выраслі прамыя і ўскосныя падаткі.

Асвета, навуковыя ўстановы. Навучанне дыскрымінацыйнае. Для дзяцей 6—14 г. яўр. нас. ўведзена абавязковае навучанне (1949), дзеці арабаў амаль паўсюдна магчымасці вучыцца. Навучанне яўрэяў і арабаў раздзельнае. У арабскіх школах з 4 кл. абавязковае вывучэнне яўр. мовы. Выхаванне і навучанне дзяцей і моладзі вядзецца ў нацыяналіст. духу, знаходзяцца пад кантролем сіянісцкіх арг-цый, у т. л. замежных, асабліва ЗША. Вял. значэнне надаецца вывучэнню рэлігіі. Пач. школа 8-гадовая. Сярэдняя школа 4-гадовая, платная, складаецца з дзвюх ступеняў па 2 гады кожная. У 1967/68 навуч. г. ў пач. школах навучалася 475,7 тыс. дзяцей, у сярэдніх — 151 тыс. чал. Прафесійна-тэхн. і с.-г. школы 4-гадовыя на базе пач. школы. ВНУ: Яўрэйскі ун-т у Іерусаліме (засн. ў 1918), ун-т у Тэль-Авіве (засн. ў 1953), політэхн. ін-т у Хайфе. Б-кі: Яўрэйская нац. б-ка і універсітэцкая б-ка ў Іерусаліме. Музеі выяўл. мастацтва ў Іерусаліме і Тэль-Авіве. Ізраільская акадэмія прыродазнаўчых і гуманітарных навук, Сусветная акадэмія яўрэйскага навучання, Ізраільскі ін-т біял. даследаванняў, Ін-т па вывучэнні Талмуду і яўрэйскага закону, Амер. ін-т па вывучэнні сяшчэннай Зямлі і інш.

Літ.: Иванов К. и Шейнис З. Государство Израиль, его положение и политика, 2 изд., М., 1959; Никитина Г. С. Государство Израиль, М., 1968; Иванов Ю. С. Осторожно: сионизм!, 2 изд., М., 1970; Волков А. Б. Развитие капиталистической экономики в Израиле, «Народы Азии и Африки», 1971, № 4.

М. Т. Раманоўскі (прырода, гаспадарка), Мінск; *Г. С. Нікіціна* (гістар. нарыс), *З. К. Навохіна* (асвета), Масква.

ІЗРАІЛЬСКАЕ ЦАРСТВА, раннерабаўладальніцкая дзяржава ў Паўн. Палесціне (935—722 да н. э.). Узнікла пасля распаду Ізраільска-Іудзейскай дзяржавы. Сталіцы І. ц.— Сіхем, Тырца, пазней Самарыя. Асн. занятак насельніцтва земляробства, было развіта рамяство. Мела гандл. і культ. сувязі з Егіптам і Фінікіяй. У выніку збяднення і закабалення свабодных сялян абвастрыліся сац. супярэчнасці. Гэта выявілася ў пропаведзях прарокаў Ісаі, Амоса і інш. Класавая барацьба, частыя войны аслаблялі І. ц. У 722 заваявана асірыйцамі. Большасць насельніцтва пераселена ў Асірыю.

ІЗРАІЛЬСКАЯ АГРЭСІЯ супраць арабскіх краін 1967, напад Ізраіля на АРЕ, Сірыю і Іарданію, які з'явіўся рэалізацыяй часткі агульнага плана агрэс. сіл міжнар. імперыялізму і сіянізму, накіраванага супраць нац.-вызв. барацьбы народаў Арабскага Усходу. З дапамогай экстрэмісцкіх колаў Ізраіля імперыялісты Захаду меркавалі ліквідаваць прагрэс. рэжымы ў шэрагу арабскіх краін, перш-наперш у АРЕ і Сірыі, змяніць кірунак паліт. развіцця краін Б. Усходу, захаваць і ўмацаваць там ключавыя пазіцыі заходніх нафтавых манаполій. Экспансіяністскія колы Ізраіля імкнуліся захапіць новыя тэрыторыі, стварыць «вялікую сіянісцкую дзяржаву ад Еўфрата да Ніла». Падрыхтоўка да вайны супраць арабаў практычна пачалася пасля правалу *англа-франка-ізраільскай агрэсіі* супраць Егіпта 1956. З удзелам ЦРУ ЗША быў распрацаваны план ваен. нападу на АРЕ і Сірыю. ЗША, ФРГ, а таксама Вялікабрытанія і інш. імперыял. краіны забяспечылі ізр. армію найноўшымі відамі ўзбраення для наступальных аперацый.

5 чэрвеня ізр. ўзбр. сілы пачалі шырокія ваен. дзеянні супраць АРЕ, Сірыі і Іарданіі. Супраціўленне араб. народаў, рух грамадскасці свету за аднаўленне міру на Б. Усходзе, рашучая пазіцыя сацыялістычных краін, асабліва Сав. Саюза, прымусілі агрэсараў спыніць 10.6.1967 ваен. дзеянні. Ізр. войскі захапілі больш за 60 тыс. $км^2$ араб. тэрыторыі, на якой устаноўлены бязлітасны акупацыйны рэжым. Карэннае араб. насельніцтва высялялецца з сектара Газы, Іерусаліма і інш. мясцін. Зняволены цэлыя населішчы, створаны канцэнтрацыйныя лагеры. Паралізавана работа Суэцкага канала. 22.11.1967 Савет Бяспекі ААН прыняў рэзалюцыю па Б. Усходзе, якая патрабуе безумоўнага вываду ізр. войск з акупаваных тэр. і гарантыі бяспекі ўсіх краін гэтага раёна. Сав. Саюз няраз выступаў з ініцыятывай паліт. урэгулявання блізкаўсходняга канфлікту, у прыватнасці прапанаваў план выканання рэзалюцыі Савета Бяспекі: абвяшчэнне абавязацельстваў краінамі, якія ваявалі, вызначэнне дэмілітарызаваных зон, увод у шэраг пунктаў войск ААН, неабходнасць міжнар. гарантый гэтых мер. З канструктыўнымі прапановамі па паліт. урэгуляванні крызісу на Б. Усходзе і ліквідацыі вынікаў агрэсіі няраз выступала АРЕ. Пануючыя колы Ізраіля пры падтрымцы ЗША, Вялікабрытаніі, ФРГ і сіянісцкіх арг-цый ігнаруюць патрабаванні рэзалюцыі Савета Бяспекі, выступаюць супраць любых спроб знайсці справядлівае вырашэнне канфлікту, імкнуцца ўтрымаць пад сваім кантролем некат. спрадвечныя араб. тэрыторыі (Галанскія вышыні ў Сірыі, Шарм аш-Шэйх у АРЕ, усх. частку Іерусаліма, сектар Газы). Аднак планы ізр. экстрэмістаў і імперыял. сіл свету змяніць кірунак паліт. развіцця арабскіх краін не адзейсніліся. Аб'ектыўны вынік агрэсіі — рост антыімперыял. прагрэс. тэндэнцый у арабскім нац.-вызв. руху. Прыход у 1969 да ўлады левых сіл у Народнай Дэмакратычнай Рэспубліцы Емен і Лівіі сведчыць пра змены ў суадносінах сіл на Б. Усходзе на карысць прагрэс. рэжымаў. Арабскія народы кансалідуюць свае намаганні. У 1971 абнародавана дэкларацыя пра стварэнне федэрацыі араб. рэспублік у складзе АРЕ, Сірыі і Лівіі. Нарастае рух супраціўлення агрэс. палітыцы ізр. ўрада ўнутры краіны. Прагрэс. сілы на чале з кампартыяй Ізраіля выступаюць за вывад ізр. войск з акупаваных араб. тэрыторый, за мірнае вырашэнне блізкаўсходняга канфлікту.

Літ.: Блищенко И. П. и Кудрявцев В. Д. Агрессия Израиля и международное право, М., 1970; Демченко П. Е. Арабский Восток в час испытаний, М., 1967; Иванов Ю. С. Осторожно: сионизм!, 2 изд., М., 1970; Сионизм — отравленное оружие империализма, М., 1970.

ІЗУБРЫЦА, возера ў бас. р. Свольны, правага прытока Дрысы (бас. Зах. Дзвіны), у Расонскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 1,19 $км^2$. Даўж. 2 *км*, найб. шыр. 0,9 *км*, сярэдняя 0,6 *км*, найб. глыб. 3,2 *м*. Катлавіна выцягнута з Пн на Пд. Вадазбор (17,2 $км^2$) сярэднеўзгорысты, складзены з марэны. Возера слаба праточнае, злучана пратокаю з воз. Бузянка. Водзяцца плотка, акунь, лешч, шчупак, язь, карась, судак.

ІЗУМРУД, разнавіднасць празрыстага *берылу*, густа афарбаванага вокісламі хрому ў ярка-зялёны колер. Выкарыстоўваецца ў ювелірнай справе як каштоўны камень. Трапляецца ў пегматытавых жылах і ў грэйзенах разам з берылам. Атрымліваюць і штучна.

ІЗЮМАЎ Мікалай Андрэевіч (24.12.1920, ст. Сім Златаустаўскага пав. Уфімскай губ.— 29.6.1944), удзельнік

Уверсе: у палатачным лагеры «Бакуар» (Іарданія 37 тыс. бежанцаў, выгнаных ізраільскімі агрэсарамі з родных мясцін, 1968 (злева); горад Ісмаілія пасля артылерыйскага абстрэлу ізраільскімі агрэсарамі. У нізе: арабскае насельніцтва, якое асталося на захопленых Ізраілем землях, жыве ва ўмовах тэрору і бяспраўя. Эль-Халіль (Хеўрон). 1969 (злева); атрад арабскіх партызан.



баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1942. На фронце з 1941. Камандзір танкавага батальёна І. вызначыўся ў баях пад Бабруйскам 24—29.6.1944. Асабіста знішчыў 7 процітанкавых гармат, 3 дзоты, 10 агнявых кропак праціўніка. Загінуў у баі.

ІЗЮМАЎ Мікалай Міхайлавіч [н. 5(18).4. 1901, Віцебск], сав. ваен. вучоны, ген.-лейт. інжынерна-тэхн. службы (1949). Д-р тэхн. н., праф. (1949). Засл. дз. нав. і тэхн. РСФСР (1963). З сям'і настаўніка. Чл. КПСС з 1937. Скончыў Маскоўскі прамысл.-эканам. ін-т (1927), Ленінградскі электратэхн. ін-т (1931). У Чырв. Арміі з крас. 1920. Удзельнік баёў з бандамі Антонава (1921). З 1926 выкладчык вышэйшых ваенна-навуч. устаноў. З 1935 нач. кафедры Ваен. электратэхн. акадэміі, з 1948 нам. нач. Ваен. акадэміі сувязі, адначасова нач. кафедры. У 1951—68 на адказных пасадах у Мін-ве абароны. Аўтар навук. прац, вынаходстваў, падручнікаў, дапаможнікаў, манаграфій па радыёпрыёме і агульнай радыётэхніцы. Узнаг. ордэнам Леніна, 5 інш. ордэнамі, медалямі. Жыве ў Маскве.



Тв.: Радиоприем, М., 1954; Курс радиотехники, 3 изд., М., 1958; Основы радиотехники, М., 1965.

ІЗЯСЛА́Ў УЛАДЗІМІРАВІЧ (да 980—1001), полацкі князь з 988. Сын кіеўскага князя Уладзіміра Святаславіча і полацкай князёўны Рагнеды Рагвалодаўны. Паводле летапіснага падання кіеўскі князь вярнуў з Кіева І. У. разам з яго маці ў Полацкую зямлю ў новапабудаваны г. Ізяслаўль (Заслаўе) і тым самым аднавіў знішчаную ім раней дынастыю полацкіх князёў. Ніканаўскі летапіс характарызуе І. У. як адукаванага чалавека.

Літ.: Повесть временных лет, ч. 1, М.— Л., 1950, с. 56, 83, 88, 254, 282, 287; Полное собрание русских летописей, т. 1, в. 2, Л., 1927, с. 299—300; тое ж, т. 9/10, М., 1965, с. 68; Алексеев Л. В. Полоцкая земля, М., 1966, с. 238—240.

М. І. Ермаловіч. Маладзечна.

ІЗЯСЛА́Ў ЯРАСЛА́ВІЧ (1024—78), князь тураўскі; вялікі князь кіеўскі [1054—78]. Старэйшы сын *Яраслава Мудрага.* У 1067 разам з братамі Святаславам і Усеваладам ваяваў супраць полацкага князя Усяслава, якога захапіў у палон. У 1068 скінуты з трону ў выніку нар. паўстання. Двойчы, з дапамогай польскіх і ням. феадалаў, вяртаўся на трон. Загінуў у міжусобнай барацьбе. Адзін са складальнікаў Праўды Яраславічаў (гл. *«Руская праўда»*).

Літ.: Соловьев С. М. История России с древнейших времен, кн. 1 (т. 1—2), М., 1962.

Г. В. Штыхаў. Мінск.

ІЗЯСЛА́ЎСКАЕ КНЯ́СТВА, удзельнае княства, якое выдзелілася з Полацкай зямлі пасля смерці кн. Усяслава Брачыславіча. Цэнтр Заслаўе.

У 1-й трэці 12 ст., магчыма, называлася Ізяслаўска-Лагожскім, дзе княжыў Брачыслаў Давыдавіч, унук Усяслава Брачыславіча. У 1-й пал. 12 ст. належала Усеваладу Глебавічу, сыну мінскага кн., з 1158 унуку полацкага кн. Рагвалода Барысавіча Брачыславу Васількавічу. З 3-й чвэрці 12 ст. да паловы 14 ст. звестак пра І. к. няма. У 1345 вял. кн. Вял. кн. Літ. Кейстут аддаў Заслаўе Яўнуцію Гедымінавічу, каля 1366 яно перайшло да яго сына Міхала. Яго нашчадкі Андрэй, Юрый, Іван мелі тытул князёў заслаўскіх. Гл. таксама *Заслаўе.*

Кр.: Полное собрание русских летописей, т. 1—2, М., 1962, т. 17, СПб., 1907.

ІКА́ЗНЬ, возера ў бас. р. Друйкі, левага прытока Зах. Дзвіны, у Браслаўскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 2,39 *км²*. Даўж. 3,4 *км*, найб. шыр. 1,1 *км*, сярэдняя 0,7 *км*, найб. глыб. 8,4 *м*. Катлавіна выцягнута з З на У. Схілы ўмерана стромкія, пераважна ворныя, паўд.-ўсходнія ўкрыты лесам. Азёрная чаша вузкім пралівам падзяляецца на зах. і ўсходні плёсы. 2 а-вы. Дно ўслана карычневым ілам (80% пл. возера); да глыбіні каля 2 *м* дно пясчанае або пясчана-ілістае. Вадазбор (24,6 *км²*) сярэднеўзгорысты. Сцёк з І. ў воз. Дрывяты праз раку Усвіцу. Водзяцца акунь, плотка, язь, лінь, шчупак, карась і інш.

ІКА́ЗНЬ, вёска ў Браслаўскім р-не Віцебскай вобл., на беразе воз. Іказнь. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Чарняхоўскага. За 15 *км* на У ад Браслава, 223 *км* ад Віцебска, 31 *км* ад чыг. ст. Міёры, на шашы Браслаў — г. п. Міёры. 268 ж., гасп. 88 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Упершыню ўпамінаецца пад 1499. У Айч. вайну 1812 спалена французамі.

ІКАНАБО́РСТВА, рэлігійна-палітычны рух у сярэднія вякі, накіраваны супраць пакланення абразам; адлюстроўваў пратэст народных мас супраць царквы і сацыяльнага прыгнёту.

Найб. пашырылася ў Візантыі (8—9 ст.), спачатку як нар. пратэст супраць прыгнёту дзяржавы і царквы, які выліўся ў барацьбу супраць пакланення абразам. Правінцыяльная ваенна-земляробчая знаць і духавенства ўзначалілі І., каб умацаваць сваё паліт. і эканам. становішча. Візант. імператары Леў III Ісаўр [716—741], Канстанцін V [741—775] і інш. выкарысталі нар. рух для барацьбы з узмацненнем манашства, канфіскоўвалі царк. маёмасць, закрывалі манастыры і інш. Супраць І. выступала гарадская знаць у саюзе з манашствам. Баючыся росту антыфеад. выступленняў, гарадская і правінцыяльная знаць аб'ядналіся. Адарванае ад нар. руху І. пацярпела паражэнне. Спачатку на 2-м Нікейскім саборы (787), а канчаткова ў 843 шанаванне абразоў было адноўлена. І. мела месца ў Расіі ў 14 ст., у Зах. Еўропе (Германіі, Нідэрландах) у 16 ст.

Літ.: История Византии, т. 2, М., 1967.

ІКАНАГРА́ФІЯ (ад грэч. éikōn абраз, вобраз+...*графія*), выява якой-небудзь асобы ці сюжэта, што паўтараецца ў шэрагу помнікаў аднолькавага зместу. Тэрмін ужываецца пераважна ў дачыненні да сярэдневяковага і царкоўнага выяўл. мастацтва, а таксама да выяў гістар. асоб (напр., іканаграфія А. С. Пушкіна).

Патрабаванне царквы даваць «гістарычна» дакладную фіксацыю аблічча святых і падзей свяшчэннага пісання прывяло да стварэння т. зв. іканаграфічнага тыпу (узора для пераймання). І. наз. таксама навука, якая займаецца апісаннем і класіфікацыяй іканаграфічных тыпаў, гісторыяй іх узнікнення і развіцця, вытлумачэннем іх сэнсу, сімволікі, атрыбутаў.

ІКАНАПІС, пісанне абразоў; від станковага *жывапісу*, творы якога служылі прадметам культу. Выявы (Хрыста, святых, Маці боскай, еванг. і біблейскіх падзей) строга рэгламентаваліся царквой, правіламі *іканаграфіі.*

Вытокі І.— у познаэліністычным партрэце (у т. л. ў *фаюмскіх партрэтах*). У сярэднія вякі І.— адзін з асн. відаў жывапісу (найчасцей у тэхніцы *тэмперы*). Пашыраны пераважна ў краінах з праваслаўным веравызнаннем. Самыя раннія абразы зберагліся ад 5—6 ст. На Русь І. прыйшоў з Візантыі з прыняццем хрысціянства і быў вядучым відам выяўл. мастацтва да канца 17 ст. (найб. значныя майстры — Феафан Грэк, 14 ст.; Андрэй Рублёў, Дыянісій, 15 ст.). З развіццём свецкага жывапісу (пач. 18 ст.) занепадае і становіцца рамяством.

На Беларусі І. пашыраны ў 14—18 ст. Бел. майстры часта аздаблялі ўзорамі німбы і адзенне святых, ператваралі фон абразоў у разьбяное залочанае поле. Твары святых мелі простанародныя рысы, ім уласціва грубаватая характарнасць. Паступова на змену плоскасным іканапісным лікам прыйшла аб'ёмная выява чалавечых твараў («Параскева Пятніца»). У абразах 17—18 ст. паяўляюцца элементы бытавога жанру («Нараджэнне багародзіцы» Пятра Яўсеевіча з Галыніч), прасторавай перспектывы («Жываносная крыніца»). Іл. гл. на ўкл.

Літ.: История русского искусства, т. 1—3, М., 1953—55.

ІКАНАСКО́П (грэч. éikōn адлюстраванне+skopeō гляджу), адзін з відаў *перадавальнай электронна-прамянёвай трубкі.*

ІКАНЫ, вёска ў Барысаўскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Замошша». За 43 *км* на ПнЗ ад Барысава, 114 *км* ад Мінска, 48 *км* ад чыг. ст. Барысаў, на аўтамаб. дарозе Бягомль — в. Зембін. 324 ж., гасп. 95 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, музей баявой і працоўнай славы, дзіцячыя яслі, фельч.-ак. пункт, магазін. У маі 1943 вёску спалілі ням.-фаш. захопнікі. Мемарыяльная дошка на брацкай магіле 576 мірных жыхароў І. і навакольных вёсак, расстраляных і спаленых ням.-фаш. акупантамі 28.5.1943. Помнік 141 земляку, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну, помнік у гонар гераічнай барацьбы партызан супраць ням.-фаш. акупантаў.

ІКА́Р, персанаж старажытнагрэчаскай міфалогіі. Гл. *Дэдал і Ікар.*

ІКАЎ Канстанцін Мікалаевіч [11(23).2.1859, Масква — 14(26).7.1895], рускі антраполаг, археолаг. Скончыў Маск. ун-т (1882). Чл. Т-ва аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі пры Маск. ун-це (1882), Парыжскага і Італьян. антрапалаг. т-ваў. Склаў першую рус. антрапалаг. і антрапаметрычную інструкцыю. У час экспедыцыі ў Мінскую і Віцебскую губ. (1886) сабраў матэрыял для асн. працы па антрапаметрыі беларусаў, рускіх і ўкраінцаў (поўнасцю не выдадзена). Удзельнічаў у археал. раскопках у Разанскай губ.

Тв.: По экспедиции в Белоруссию летом 1886 г. Отчет, «Известия имп. Об-ва любителей естествознания, антропологии и этнографии...», 1887, т. 51; Заметки по кефалометрии белорусов сравнительно с велико- и малороссами, там жа, 1890, т. 68.

Літ.: Анучин Д. Константин Николаевич Иков, «Известия имп. Об-ва любителей естествознания, антропологии и этнографии...», 1897, т. 90.

Л. В. Аляксееў. Масква.

ІКО́НА, абраз (грэч. éikōn выява, вобраз), рэльефная або жывапісная выява багоў ці святых, якая служыць прадметам рэлігійнага пакланення.

Шанаванне І. пашырана ў праваслаўі, каталіцызме, будызме, ламаізме. Узнікла на аснове фетышысцкіх і магічных уяўленняў першабытных людзей, якія прыпісвалі розным прадметам надпрыродныя ўласцівасці. Культ І. запазычаны з больш стараж. рэлігій, замацаваўся ў хрысціянстве ў 4 ст., калі яно стала афіц. рэлігіяй Рымскай імперыі. Сродак ідэалаг. ўздзеяння царквы на масы, крыніца даходаў духавенства. У гісторыі выяўл. мастацтва І.— станковы твор рэліг. жывапісу (гл. *Іканапіс*). У праваслаўнай царкве сюжэт і кампазіцыя І. былі строга кананізаваны: каб майстры прытрымліваліся ўстаноўленага ўзору, ім давалі спец. арыгіналы — «аблічныя» і «тлумачальныя». Цэнтр. буйную выяву часта суправаджалі шматлікія дробныя (клеймы). І. пісалася звычайна на драўлянай дошцы па грунце (леўкасе) яечнымі фарбамі. Фон выявы і інш. яе часткі нярэдка закрываліся ўмацаванымі зверху тонкімі метал. лістамі з ціснёным узорам — басмай (пашырана з 16 ст.; гл. таксама *Абклад*). У бел. І., асабліва ў 17—18 ст., замест басмы выкарыстоўваўся вызалачаны арнаментальны разьбяны фон. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Іканапіс.*

ІКРА́, жаночыя полавыя клеткі (яйцаклеткі) рыб, малюскаў, ракападобных, ігласкурых, земнаводных і некат. інш. жывёл. Асобныя ікрынкі звычайна злучаны сліззю, якая абвалаквае кожную яйцаклетку пры праходжанні яе па полавых шляхах самкі.

Найчасцей І. адкладваецца ў ваду, дзе апладняецца самцом; зрэдку аплодненая І. выношваецца самкаю ці самцом у спец. прыстасаваннях (скурныя мяшкі, адтуліны, складкі і інш.); прэснаводная рыба гарчак адкладвае аплодненую І. ў жаберную поласць двухстворкавых малюскаў. Памер ікрынак рыб розны: ад 0,23 *мм* (у вугра) да 18 *мм* (у некат. сомавых). І. рыб і ігласкурых (марскіх вожыкаў) ядомая. Адрозніваюць 3 асн. віды І.: чорную з асятровых рыб (бялуга, асётр, сяўруга, шып); чырвоную з ласасёвых рыб (кета, гарбуша, кіжуч, нерка і інш.); часцікавую з часцікавых рыб (вобла, лешч, судак, сазан, шчупак і інш.).

ІКСО́ДАВЫЯ КЛЯШЧЫ́, іксадзіды (Ixodidae), надсямейства іксадоідных кляшчоў атр. Parasitiformes. Вядома каля 12 родаў, пашыраных ва ўсім свеце. У фаўне СССР 7, на Беларусі — 2 роды (больш за 10 відаў).

Даўж. галодных кляшчоў 3—5 *мм*, тых, што напіліся крыві,— 10—25 *мм*. І. к.— часовыя вонкавыя паразіты млекакормячых, птушак, паўзуноў, земнаводных. Развіваюцца з яец, адкладзеных самкаю (3—15 тыс.) на зямлю. Паводле тыпу кармлення бываюць адна-, двух-, трохгаспадаровыя. Многія іксадзіды пераносяць узбуджальнікаў каля 20 інфекц. і паразітарных хвароб чалавека, свойскіх і дзікіх жывёл (кляшчовага энцэфаліту, тулярэміі, чумы, бруцэлёзу, бабезіёзу і інш.). Найб. пашыраных І. к.— пераносчыкаў гемаспарыдыёзаў — на Беларусі з 20-х г. 20 ст. даследавалі М. А. Аленеў, П. У. Барцэвіч, В. Ф. Гусеў, С. П. Сузько, З. З. Сяргеева, І. Ц. Арзамасаў і інш.



Іксодавы клешч Dermacentor pictus.

Літ.: Сердюкова Г. В. Иксодовые клещи фауны СССР, М.— Л., 1956; Жизнь животных, т. 3, М., 1969; Дылько М. І. Відавы састаў і распаўсюджанне іксодавых кляшчоў і гемаспарыдзій буйной рагатай жывёлы па ніжняму цячэнню ракі Гарынь, «Весці АН БССР», 1954, № 2.

М. І. Дылько. Мінск.

ІКТА́ (араб. літаральна — надзел), у сярэднія вякі ўмоўнае падараванне зямельна-

га надзелу феадалу за ваенную ці грамадзянскую службу ў краінах Блізкага і Сярэдняга Усходу (тыпу *бенефіцыя* ў Еўропе).

І. называлі таксама падараванне права збору ўсіх ці частак падаткаў з пэўных абласцей. Пашырылася ў Іране, Сярэдняй Азіі, Егіпце і інш. Паступова ператварылася ва ўмоўную прыватную ўласнасць. Рост зямель І. і змяншэнне фонду дзярж. зямель сталі адной з прычын феад. раздробленасці дзяржаў.

ІКТІН (Iktînos; г. н. і см. невяд.), старажытнагрэчаскі архітэктар 2-й пал. 5 ст. да н. э. Пабудаваў *Парфенон* у Афінах (447—438 да н. э., з *Калікратам*), Тэлестэрыён у Элеўсіне (30-я г. 5 ст. да н. э.), храм Апалона Эпікурыя ў Басах (каля 430 да н. э.), у якім упершыню выкарыстаў карынфскую капітэль.

ІЛ (мул), тонкадысперсны асадак з мінеральных і арганічных часцінак памерамі пераважна менш за 0,01 *мм* на дне вадаёмаў. Намнажаецца ў спакойным ці слабарухомым асяроддзі — на дне акіянаў, мораў, азёраў, у поймах рэк (гл. *Азёрныя адклады*, *Марскія адклады*).

У прыродным стане гэта цякучы ці мяккі, пластычны, багаты вадою грунт, пры засыханні набывае ўласцівасці цв. цела. У залежнасці ад умоў утварэння (тыпу басейна, глыбіні і клімату) у ілах пераважаюць вапняковыя, крамяністыя ці гліністыя часцінкі. Нярэдка І. змяшчае значную колькасць арган. рэчываў, згніванне якіх выклікае серавадароднае заражэнне ці развіццё гніласных працэсаў (гніці, сапрапелевы І.). Адрозніваюць І. марскія і кантынентальныя (азёрныя, азёрна-балотныя, рачныя); на Беларусі пашыраны сапрапелевыя. З І. стараж. геал. эпох пры дыягенезе ўзніклі разнастайныя асадкавыя горныя пароды (аргіліты, мергелі, гліністыя вапнякі і інш.).

ІЛАВА, возера ў бас. Дзісны, левага прытока Зах. Дзвіны, у Міёрскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 1,49 *км²*. Даўж. 1,6 *км*, найб. шыр. 1,3 *км*, сярэдняя 0,9 *км*, найб. глыб. 13 *м*. Катлавіна круглаватая, схілы спадзістыя. Вадазбор (19,8 *км²*) забалочаны. Водзяцца плотка, верхаводка, судак, шчупак, акунь, карась; ёсць вугор.

ІЛАВАЙСКІ Дзмітрый Іванавіч (1832—1920), рускі гісторык дваранска-манархічнага кірунку. Скончыў Маскоўскі ун-т (1854). Пэўнае навук. значэнне мела яго праца «Гродзенскі сейм 1793 года. Апошні сейм Рэчы Паспалітай» (1870). У «Гісторыі Расіі» (1—5 т., 1876—1905), якая мела кампілятыўны характар, сабраны фактычны матэрыял па гісторыі Вял. кн. Літоўскага (т. 2 — Маскоўска-літоўскі перыяд, ці збіральнікі Русі, 1884). Аўтар афіц. падручнікаў па ўсеагульнай і расійскай гісторыі для сярэдняй школы, у якіх зводзіў гісторыю пераважна да дзейнасці цароў і палкаводцаў.

Літ.: История исторической науки в СССР. Дооктябрьский период. Библиогр., М., 1965.

ІЛАЗАРАЎ Іса Ілазаравіч (20.2.1920, Нальчык — 6.9.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Канд. у чл. КПСС. На фронце з 1941. Вызначыўся 22.6.1944 пры прарыве абароны праціўніка каля в. Карташы Сіроцінскага р-на Віцебскай вобл. Замяніў камандзіра, які выбыў са строю, падняў байцоў у атаку. Рота ўварвалася ў варожыя траншэі і авалодала вёскаю. Знішчыў 5 кулямётных кропак. Загінуў у баі.

ІЛАРЫЁНАЎ Сцяпан Іларыёнавіч (1904, в. Кіўсерт-Япішава Ядрынскага пав. Казанскай губ.— 27.6.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). На фронце з 1942. Вызначыўся ў Віцебскай вобл. 25.6.1944 яфрэйтар І. першы фарсіраваў Зах. Дзвіну каля в. Балбечча Бешанковіцкага р-на. У няроўным баі за плацдарм прыняў камандаванне на сябе, захапіў траншэі праціўніка; паранены не пакінуў поля бою. Памёр ад ран. Пахаваны ў в. Галыні Бешанковіцкага р-на.

ІЛАХАБА́Д, Алахабад (стараж. назва Праяга), горад у Індыі, у штаце Утар-Прадэш, пры зліцці Джамны і Ганга. Вузел чыг. і аўтамаб. дарог. 522 тыс. ж. (1969). Гандл. цэнтр. Адзін з старэйшых гарадоў Паўн. Індыі. Многа стараж. помнікаў. Цукровая, шкляная, харч., тытунёвая, баваўняная прамысловасць. Ун-т (з 1887).

ІЛГАЙЦЫ, возера ў бас. р. Дрысвяты, у Браслаўскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 0,54 *км²*. Даўж. 2 *км*, найб. шыр. 0,4 *км*, сярэдняя 0,27 *км*, найб. глыб. 15,8 *м*, сярэдняя 4,4 *м*. Катлавіна выцягнута з ПнЗ на ПдУ. Схілы ўмерана стромкія, выш. 8—12 *м*, пераважна ўкрытыя лесам і хмызняком. Паўд.-заходні бераг нізкі, забалочаны. Літараль услана зялёным пяском, найбольш глыбакаводная ч. краменязёмістым алеўкавым і карычневым сапрапелем. Вадазбор (6,75 *км²*) сярэднеўзгорысты. Воз. зарастае каля берагоў вузкаю палосаю (чарот, трысняг, урэчнік). Водзяцца плотка, шчупак, акунь, лінь, мянтуз, язь, судак, верхаводка.

ІЛЕШ (Illés) Бела (н. 22.3.1895, г. Каша) венгерскі пісьменнік, адзін з пачынальнікаў сацыяліст. рэалізму ў венг. л-ры. Чл. ВКП з 1919. Скончыў юрыд. ф-т Будапешцкага ун-та. Удзельнік рэвалюц. руху 1918—19 у Венгрыі. Пасля паступлення рэакцыі эміграваў у Вену. У 1920 на нелегальнай рабоце ў Закарпацкай Украіне. З 1921 жыў у Аўстрыі і Чэхаславакіі, у 1923—45 у СССР. Адказны сакратар Міжнар. бюро рэвалюц. л-ры (1929—30); чл. прэзідыума і адказны сакратар (1930—32), ген. сакратар (1932—35) Міжнар. аб'яднання рэвалюц. пісьменнікаў. Друкавацца пачаў у 1916. Аўтар раманаў «Ціса гарыць» (кн. 1—3, апубл. ў Маскве ў 1929—33; бел. пер. 1932—34; выд. ў Венгрыі ў 1957), «Карпацкая рапсодыя» (рус. пер. 1941, апубл. ў Венгрыі ў 1946), «Здабыццё радзімы» (1952—54). Раманы «Я апяваю героя і зброю» (1949) і «Бітва каля Камедыйнага тэатра» (1950) прысвечаны вызваленчай місіі Сав. Арміі. Аповесць «Маладзечна» пра падзеі 1-й сусв. вайны на Беларусі друкавалася ў газ. «Звязда» (1927). У 1930 наведаў Мінск. Прэмії імя Кошута (1950 і 1955).

Тв.: Бел. пер.— Вецер з Усходу. [Урывак з рамана], Мн., 1930; рус. пер.— Обретение родины, М., 1959.

ІЛЖЭДЗМІТРЫЙ I (каля 1581 — 17.5.1606), паліт. авантурыст, які выдаваў сябе за царэвіча Дзмітрыя, сына цара Івана IV. Асоба І. І зусім не высветлена. Існуе версія, быццам ён — збеглы манах Чудава манастыра Рыгор Атрэп'еў. Выступіў як прадстаўнік апазіцыйна настроенага маскоўскага баярства. Падтрыманы рэакц. каталіцкімі коламі Рэчы Паспалітай, у 1604 з атрадамі польскай, літ. і бел. шляхты, запарожскіх і данскіх казакоў уварваўся ў межы Расіі, выкарыстаў антыфеад. выступленні сялян і казацтва, незадаволенасць баяр палітыкай цара Барыса. 20.6.1605 заняў Маскву і каранаваны царом (21.7.1605). Грабяжы польска-літоўскіх інтэрвентаў і павелічэнне падаткаў выклікалі народнае паўстанне, у час якога забіты змоўшчыкамі-баярамі на чале з В. І. Шуйскім.

Літ.: Платонов С. Ф. Очерки по истории смуты в Московском государстве XVI—XVII вв., М., 1937; Щепкин Е. Н. Димитрий I, у кн.: Русская история в очерках и статьях, т. 2, М., 1910.

ІЛЖЭДЗМІТРЫЙ II (г. н. невяд.— 11.12.1610), паліт. авантурыст, выдаваў сябе за царэвіча Дзмітрыя — сына Івана IV. Стаўленік агрэс. колаў Рэчы Паспалітай, якія двойчы выкарысталі імя Дзмітрыя ў адкрытай інтэрвенцыі супраць Расіі (гл. таксама *Ілжэдзмітрый I*). Асоба І. II не высветлена. Есць звесткі, што быў настаўнікам у Магілёве, па інш. звестках паповіч, настаўнік у Шклове. Распачаў паходы на Бранск, Тулу, у маі 1608 разбіў войскі В. І. Шуйскага, падступіў да Масквы і спыніўся каля с. Тушына (адсюль мянушка «Тушынскі злодзей»), дзе сфарміраваў «урад» з рус. баяр і дваран. Фактычна Тушынскі лагер узначальвалі кіраўнікі польска-літоўскіх атрадаў — кн. Ружынскі, Ян Сапега, Лісоўскі. Войска І. II складалася з польскіх атрадаў, рус. паўд. дваранства, казакоў, атрадаў разбітых войск Балотнікава. Увосень 1608 устанавіў кантроль над раёнамі на Пн, У і ПнЗ ад Масквы. У снеж. 1609 І. II збег у Калугу. У ліп. 1610 падступіў да Масквы, але ў жн. зноў адступіў у Калугу, там забіты.

Літ.: Шепелев И. С. Освободительная и классовая борьба в Русском государстве в 1608—1610 гг., Пятигорск, 1957. *А. П. Грыцкевіч.* Мінск.

ІЛЖЭСВЕДЧАННЕ, заведама ілжывае паказанне сведкі. Гл. ў арт. *Злачынствы супраць сацыялістычнага правасуддзя*.

ІЛІ, рака ў Каз. ССР і ў Кітаі. Утвараецца ад зліцця вытокаў Тэкес і Кунгес, якія пачынаюцца ў Усх. Цянь-Шані. Даўж. 1001 *км*, у межах СССР (Каз. ССР) каля 815 *км*. Пл. бас. 153,8 тыс. *км²*. Упадае ў воз. Балхаш.

У верхнім цячэнні горная рака; ніжэй вусця р. Каш да пас. Ілі цячэ па шырокай даліне ў нізкіх, месцамі забалочаных берагах. Потым прарэзвае плато Караой і выходзіць у пяскі Таукум і Сары-Ішыкатраў. У вусці ўтварае дэльту. Гал. прытокі: левыя — Чарын, Чылік, Талгар, Каскелен, Курты; правыя — Каш, Харгос. Жыўленне снегавое і ледавіковае. Ледастаў снеж.— сакавік. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 450 *м³/сек*. Выкарыстоўваецца для арашэння. Суднаходная ад г. Кульджа (Кітай) да с. Баканас (Каз. ССР). На І. Капчагайская ГЭС.

ІЛІЁН, адна з назваў *Troi*, старажытнага горада ў Малой Азіі. Паводле падання стараж. грэкаў заснаваны царскім сынам Ілам па волі Зеўса.

ІЛІНОЙС (Illinois), штат на Пн ЗША, паміж воз. Мічыган і р. Місісіпі. Пл. 146,1 тыс. *км²*. Нас. 11 047 тыс. чал. (1969). Адм. ц. Спрынгфілд. Найб. гарады: Чыкага, Пеорыя, Іст-Сент-Луіс. Паверхня — узгорыстая раўніна выш. да 378 *м* над узр. м. Глебы чарназёмныя. Радовішчы кам. вугалю, нафты, газу, цынкавых рудаў. Клімат кантынентальны. Найб. рэкі: Місісіпі, Іліной, Агайо. І. займае 3-е месца ў ЗША па кошце прамысл. і 3—4-е па кошце с.-г. прадукцыі. Здабыча кам. вугалю, нафты, газу. Машынабудаўнічая (у т. л. с.-г., вагона-, аўта- і самалётабуд.), эл.-тэхн., харч. (у т. л. мясная, мукамольная), металург., хім., палігр., тэкст. прамысловасць. Вырошчваюць кукурузу (2-е месца ў ЗША па зборы) і сою (1-е па зборы), пшаніцу, садавіну, агародніну. Гадуюць буйн. раг. жывёлу, авечак, свіней. Транспарт чыг. і аўтамабільны. Суднаходства па Іліной скай воднай сістэме і Вялікіх азёрах.

ІЛІРЫЙЦЫ (лац. Illyrici), старажытныя індаеўрапейскія плямёны, якія ў 1-м тысячагоддзі да н. э. насялялі тэрыторыю ПнЗ Балканскага п-ва ад узбярэжжа Адрыятычнага м. да Дуная.

Найб. вядомыя з гэтых плямёнаў істры, яподы, далматы, лібурны і інш. Спачатку засялялі значную тэр. ў Цэнтр. Еўропе, але былі выцеснены *кельтамі*. На ПнЗ межавалі з кельтамі, на У з фракійцамі. Вялі працяглую барацьбу з Рымам (з 3 ст. да н. э.). Завяваны рымлянамі ў 1 ст. да н. э. Паступова асіміляваліся.

ІЛІЯ, рака, левы прыток Віліі (бас. Нёмана). Даўж. 78 *км*. Утвараецца ад зліцця рэк Каменкі і Бачылаўкі, цячэ ў Лагойскім і Вілейскім р-нах Мінскай вобл. Пл. вадазбору 1300 *км²*. Верхняя ч. размешчана на паўн.-зах. схілах Мінскага ўзв., ніжняя на паўд.-ўсх. ускраіне Нарачана-Вілейскай нізіны. Пад балотамі 11%, пад лесам 35, пад ворывам 35% вадазбору. Асн. прытокі: Сліжанка, Выпрата (злева), Рыбчанка, Дроздка (справа). Ледастаў з 3-й дэкады снеж. да канца сакавіка. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 9 *м³/сек*. Уваходзіць у Вілейска-Мінскую водную сістэму.



Ільвіны зеў вялікі.

ІЛЬВІНЫ ЗЕЎ (Antirrhinum), род дэкаратыўных травяністых раслін сям. залознікавых. Вядома больш за 40 відаў, пашыраных у Паўн. паўшар'і. На Беларусі культывуецца І. з. вялікі (A. majus).

І. з. вялікі — аднагадовая травяністая расліна, выш. 30—70 *см*, з ланцэтным лісцем і з двухгубымі чырвонымі, жоўтымі або белымі кветкамі, размешчанымі ў гронках на канцы сцябла. Вырошчваецца на клумбах і рабатках. Есць махрыстыя сарты.

Літ.: Гл. пры арт. *Дэкаратыўныя расліны*.

ІЛЬГАЧОЎ Іван Васілевіч (н. 1902, с. Чувашская Кулатка Нікалаеўскага пав. Самарскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). На фронце з 1943, сапёр. Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра каля Лоева Гомельскай вобл. У ноч на 16.10.1943 на пароме пераправіў на правы бераг ракі 4 процітанкавыя гарматы, 5 мінамётных батарэй і 4 артбатарэі з боепрыпа-

самі, гэтым садзейнічаў авалоданню плануармам. Жыве ў Ульянаўскай вобл.

ІЛЬГОТЫ, прывілеі для пэўных асоб, груп насельніцтва або поўнае ці частковае вызваленне іх ад выканання прадугледжаных законам некаторых абавязкаў. Вызначаюцца законадаўствам СССР і саюзных рэспублік для паляпшэння ўмоў жыцця і працы сав. грамадзян; адлюстроўваюць клопаты сав. дзяржавы аб працоўных.

І. даюцца ваеннаслужачым і членам іх сем'яў (захоўванне месца работы, залік воінскай службы ў працоўны стаж, поўнае ці частковае вызваленне ад асобных відаў падаткаў некат. катэгорый ваеннаслужачых, захоўванне права на жылую плошчу на тэрмін абавязковай службы, прывілеі пры паступленні ў навуч. ўстановы асоб, звольненых з кадраў арміі і флота, штомесячная дапамога на дзяцей ваеннаслужачых тэрміновай службы і інш.). Інваліды Вял. Айч. вайны маюць права на пераважнае абслугоўванне іх у амбулаторна-паліклінічных установах і нечарговую гаспіталізацыю, права на пераважнае забеспячэнне жыллём. Некат. катэгорыі інвалідаў Вял. Айч. вайны маюць права бясплатнага праезду на ўсіх відах гарадскога пасажырскага транспарту (акрамя таксі) і інш. Шэраг І. прадугледжаны заканадаўствам для цяжарных жанчын і многадзетных маці (гл. *Охова материнства и детства*), для студэнтаў завочных і вячэрніх сярэдніх спец. і вышэйшых навуч. устаноў (гл. *Водпуск*). Студэнтам ВНУ, якія вучацца з адрывам ад вытворчасці, даецца адтэрміноўка ад прызыву на абавязковую ваенную службу. Пэўныя катэгорыі насельніцтва вызваляюцца ад платы с.-г. і інш. відаў *падаткаў*. Для асоб, якія працуюць у раёнах Крайняй Поўначы, прадугледжаны надбаўкі да заработнай платы, дадатковыя водпускі, павышаны памер сутачных і інш. Заканадаўствам СССР вызначаны і шэраг іншых І. Паводле рашэнняў XXIV з'езду КПСС прадугледжваецца далейшае пашырэнне падатковых І. для некат. катэгорый працоўных.

Літ.: Аваков М. М. и Глозман В. А. Трудовое законодательство, Мн., 1971; Барбараш З. Б. Льготы по труду для женщин — рабочих и служащих, М., 1961; Дворжиков И., Лившиц Р. и Румянцева М. Трудовое законодательство, М., 1971. *А. А. Крайчанка.* Мінск.

ІЛЬІН Аляксандр Мікалаевіч (1893, Масква — 7.5.1919), ваенны і паліт. кіраўнік паўстанцкіх камуніст. войск на Палессі ў грамадз. вайну. З рабочых.



Чл. КПСС з 1917. Удзельнік Кастр. рэвалюцыі на Украіне. З ліст. 1918 агент Надзвычайнай камісіі па забеспячэнні Чырв. Арміі ў раёне Лунінец — Сарны — Роўна, дамогся ад ням. акупантаў перадачы яму артыл. складаў і інш. ваен. маёмасці б. царскай арміі. Для абароны гэтага раёна ад пятлюраўцаў сфарміраваў з палескіх паўстанцаў 3 палкі (каля 3 тыс. чал.). Старшыня Ваен. савета камуніст. паўстанцкіх войск Беларусі і З Украіны, чл. Палескага рэўкома. Распрацаваў план разгрому пятлюраўцаў, з часцямі Чырв. Арміі вызваліў Сарны, Корасцень. Загінуў у баі пад Шапятоўкай. Пахаваны ў Мінску.

Літ.: Почапин С. В грозовом восемнадцатом, Мн., 1969. *К. І. Цішчанка.* Роўна.

ІЛЬІН Іван Гаўрылавіч (н. 19.12.1918, в. Калдзіна Новаузенскага пав. Самарскай губ.), адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Магілёўскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1940. Скончыў ваен. вуч. (1941), Рэспубліканскую парт. школу пры ЦК КПБ (1953), Вышэйшую парт. школу пры ЦК КПСС (1959). З 1936 на камсамольскай і гасп. рабоце, з 1939 у Чырв. Арміі. З чэрв. 1942 у партызанах — нач. штаба брыгады, камандзір атрада; з снеж. 1943 камандзір *Круглянскай ваенна-аператыўнай групы* Магілёўскай вобл. Пасля вайны на парт. і гасп. рабоце. Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі. Жыве ў Баграціёнаўску Калінінградскай вобл.

ІЛЬІН Сцяпан Пятровіч [н. 12(25).8.1914, с. Крывое Возера Какчэтаўскага пав. Акмолінскай вобл.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). Чл. КПСС з 1943. На фронце з 1942. Вызначыўся ў Гомельскай вобл. ў кастр. 1943. Пад агнём праціўніка пераправіў на зах. бераг Дняпра тры ўзводы дэсантнай пяхоты, кулямётным агнём памог захапіць варожыя траншэі. Жыве ў Ташкенцкай вобл.

ІЛЬІНІЧ Мацвей Ігнатавіч [н. 16(29).11.1898, в. Гняздзілава Барысаўскага пав. Мінскай губ.], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Баранавіцкай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1920. Скончыў Свярдлоўскі камуніст. ун-т (1928). З 1916 рабочы, з 1920 у Чырв. Арміі, з 1922 на парт., пед. і сав. рабоце ў Цюменскай і Чэлябінскай акр. У партызанах з ліст. 1942 — кіраўнік дыверсійнай групы, камісар атрада; з ліст. 1943 камісар *партызанскай брыгады Першамайскай* Баранавіцкай вобл., адначасова сакратар Карэліцкага падпольнага райкома КП(б)Б. Пасля вайны на парт. і сав. рабоце ў Баранавіцкай і Маладзечанскай абл. Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі. Жыве ў Маладзечне.

ІЛЬІНКА, даўні рускі сорт грушы. Плады важаць 95—105 *г*, зялёныя з невялікім румянцам; мякаць белая, салодкая, крыху даўкая; паспяваюць у 2-й пал. ліпеня, ляжаць 10—15 дзён. Пладаносіць на 7—8-м годзе, у 25—30 гадоў дае 120—160 *кг* пладоў з дрэва. У вільготныя гады І. псуе парша. Пашырана ў цэнтр. і паўд. садовых зонах БССР. Найлепшыя апыляльнікі: *Лімонаўка, Любімца Клапа, Панна* і *Безнасенка.*

ІЛЬІНКОЎСКІ Міхаіл Кузьміч [н. 9(22).11.1903, маёнтак Дабрынь Мазырскага пав. Мінскай губ.], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху ў Палескай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1939. З 1921 на пед. і сав. рабоце. У партызанах з жн. 1941. З лют. 1943 камісар *партызанскай брыгады Мазырскай* імя Аляксандра Неўскага Палескай вобл., сакратар Мазырскага падпольнага райкома КП(б)Б. Пасля вайны нам. старшыні Палескага, старшыня Пінскага аблвыканкомаў, сакратар Іванаўскага райкома КПБ, кіраўнік спраў Савета Міністраў БССР, нач. аддзела Мін-ва харч. прамысловасці. На XVIII—XX з'ездах КП(б)Б выбіраўся канд. у чл. ЦК, на XXI—XXIV чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета БССР 3—5-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі. Жыве ў Мінску.

ІЛЬІНСКІ Аляксандр Аляксеевіч [н. 1(14).7.1917, в. Буклава Тульскага пав.], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Магілёўскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1944. Скончыў Мінскі буд. тэхнікум (1960). З 1936 працаваў у калгасе, з 1939 у Чырв. Арміі. У партызанах з студз. 1942 — камандзір узвода, нам. камандзіра атрада, палка; з 18.2.1944 камандзір *партызанскага палка 121-га* імя А. Касаева Магілёўскай вобл. Пасля вайны на сав. і гасп. рабоце. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі. Жыве ў Чэрыкаве.

ІЛЬІНСКІ Аляксандр Канстанцінавіч [29.10(11.11).1903, Мір Навагрудскага пав. Мінскай губ.— 18.3.1967], беларускі савецкі акцёр. Нар. арт. СССР (1953). Чл. КПСС з 1945. Пачаў творчую дзейнасць у 1919 у Першым т-ве бел. драмы і камедыі, працаваў у Т-ры рэвалюц. сатыры, БДТ-1 (Мінск). Пасля заканчэння Бел. драм. студыі ў Маскве (1926) у т-ры імя Я. Коласа. Акцёр шырокага дыяпазону. Сцэн. майстэрства І. вызначалася бліскучым камед. талентам, народнасцю і нац. самабытнасцю, высокай акцёрскай тэхнікай. Вострае пачуццё гумару, кантрастнасць эмац. фарбаў, творчая імправізацыя, гратэскавыя прыёмы спалучаліся з тонкім аналізам, псіхал. глыбінёй ролі. Яго эпізадычныя ролі багатыя яркасцю фарбаў, жыццёвай праўдзівасцю. Дакладным сац. гучаннем вызначаліся ролі класічнага рэпертуару: Рабінзон, Аркашка Шчасліўцаў («Беспасажніца», «Лес» А. Астроўскага), Расплюеў («Вяселле Крачынскага» А. Сухаво-Кабыліна), Печанегаў, Барон («Ворагі», «На дне» М. Горкага), Хлестакоў («Рэвізор» М. Гогаля), Тэўе («Тэўе-малочнік» паводле Шолам-Алейхема), Палоній і Далакоп («Гамлет» У. Шэкспіра). У сав. п'есах: Лянчыцкі («Байцы» Б. Рамашова), Швандзя («Любоў Яравая» К. Транёва), Фаюнін («Нашэсце» Л. Лявонава), Капітон Ягоравіч («Шануй бацьку свайго» В. Лаўрэнцьева) і інш. З бел. рэпертуару: Дзяменя, дзед Талаш («Вайна вайне», «У пушчах Палесся» Я. Коласа), Харкевіч («Пагібель воўка» Э. Самуйлёнка), Несцерка («Несцерка» В. Вольскага, Дзярж. прэмія СССР 1946), Пытляваны («Пяюць жаваранкі» К. Крапівы), дзяк Бацяноўскі («Навальніца будзе» паводле Я. Коласа), дзед Нупрэй («Алазанская даліна» К. Губарэвіча і І. Дорскага), Мочак-Мачульскі («Лявоніха» П. Данілава), Гукан («Сэрца на далоні» паводле І. Шамякіна). Дэп. Вярх. Савета БССР 4 і 5-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, 3 інш. ордэнамі, медалямі. Імем І. названа вуліца ў Віцебску. Іл. гл. таксама на ўкл. да арт. *Акцёрскае мастацтва.*



Літ.: Скібнеўскі А. Народны артыст СССР А. К. Ільінскі, Мн., 1954. *У. М. Стэльмах.* Мінск.

ІЛЬІНСКІ Ігар Уладзіміравіч [н. 11(24).7.1901, Масква], рускі савецкі акцёр тэатра і кіно. Нар. арт. СССР (1949). Чл. КПСС з 1960. У 1920—35 у т-ры РСФСР 1-м (т-р імя Меерхольда), з 1938 у Малым т-ры. Выканаўца пераважна камед.-сатырычных роляў. Псіхал. глыбіню спалучае з гратэскавымі, эксцэнтрычнымі прыёмамі. Ролі: Прысыпкін («Клоп» У. Маякоўскага), Хлестакоў («Рэвізор» М. Гогаля), Шчасліўцаў, Юсаў («Лес», «Даходнае месца» А. Астроўскага), Часнок («У стэпах Украіны» А. Карнейчука), Акім («Улада цемры» Л. Талстога). З 1924 здымаецца ў кіно: «Волга-Волга», «Карнавальная ноч» і інш. Дзярж. прэміі СССР 1941, 1942, 1951. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, 3 інш. ордэнамі, медалямі.

Тв.: Сам о себе, М., 1962.

Літ.: Владимирова З. Игорь Ильинский, М., 1967; Хайченко Г. А. Игорь Ильинский, М., 1962.

ІЛЬІНСКІ Рыгор Андрэевіч [11(23).3.1876, Пецярбург — 1937], рускі мовазнавец-славіст. Чл.-кар. АН СССР (1921), Балгарскай (1929) і Польскай (1930) АН. Праф. Нежынскага гісторыка-філал. ін-та (1909—15), Юр'еўскага (1916—20), Саратаўскага (1920—24), Маскоўскага (з 1927) ун-таў. Аўтар прац па этымалогіі, параўнальна-гістар. граматыцы слав. моў, гісторыі слав. пісьменнасці і гісторыі славістыкі. У даследаваннях выкарыстоўваў факты бел. мовы: «Блр. петра=рус. «болото, трясина, дебри» (1928), «Гук ch у славянскіх мовах» (1915), «Аб канчатку -эй наз. скл. адз. л. мужч. роду прым. і займ. у ўсх.-слав. мовах наогул і ў бел. паасобку» (1929) і інш.

Тв.: Праславянская грамматика, Нежин, 1916; Опыт систематической кирилло-мефодиевской библиографии, София, 1934.

Літ.: Журавлев В. К., Г. А. Ильинский, М., 1962 (бібліягр.).

ІЛЬМЕНІТ (ад назвы Ільменскіх гор на Паўд. Урале), мінерал класа вокіслаў $FeTiO_3$. Руда на тытан.

Змяшчае жалеза 36,8%, тытану 31,6%, часам прымесі магнію, марганцу. Крышталі ромбаэдрычныя, тоўстатаблітчастыя, пласцінчатыя трыганальнай сістэмы, агрэгаты зярністыя. Колер жалеза-чорны. Бляск паўметалічны. Цв. 5—6, шчыльн. 4720 *кг/м*³. Слаба магнітны. Трапляецца ўкрапленнямі ў вывергнутых горных пародах асноўнага саставу, у шчолачных пародах і ў россыпах (другасныя радовішчы). У гідратэрмальнаизмененых пародах пераходзіць у лейкаксен. Радовішчы на Урале, на Украіне (россыпы), у Нарвегіі, Францыі.

А. К. Ільінскі ў ролях Аркашкі (злева) і дзеда Талаша.



ІЛЬМЕ́НСКІ ДЗЯРЖА́ЎНЫ ЗАПАВЕ́ДНІК імя У. І. Леніна, на тэр. Чэлябінскай вобл. Заснаваны 14.5.1920 як мінералагічны паводле дэкрэта СНК, падпісанага У. І. Леніным. З 1.12.1935 пераўтвораны ў комплексны запаведнік для аховы і вывучэння ў прыродных умовах і натуральным заляганні самай багатай у свеце калекцыі мінералаў і горных парод, а таксама флоры і фаўны. Імя Леніна прысвоена 16.5.1940.

Пл. 320 км². Уключае Ільменскі горны хрыбет і прылеглыя ўсх. перадгор'і Урала з шматлікімі азёрамі. Жывёльны свет разнастайны: больш як 40 відаў млекакормячых, 200 — птушак, 14 — рыб і інш. На тэр. запаведніка выяўлены амаль усе галоўныя мінералы Зямлі (каля 200), больш за 30 тут знойдзены ўпершыню (ільменіт, канкрыніт, самарскіт, вішневіт і інш.). У ільменскіх капальнях раней адабывалі рэдкія мінералы і каштоўныя камяні (тапаз, аквамарын, сапфір, гранат, горны хрусталь, амазаніт і інш.). Пры запаведніку музей прыроды Паўд. Урала, біял. станцыя Уральскага філіяла АН СССР і лабараторыі для навук. даследаванняў.

Літ.: Заповедники Советского Союза, М., 1969.

ІЛЬМЕ́НСКІЯ СЛАВЯ́НЕ, паўночная група ўсходніх славян, якія ў 6—10 ст. жылі на ўзбярэжжы воз. Ільмень, у басейнах рэк Волхаў, Ловаць, Мста і ў вярхоўі Малогі. Пазней на землях І. с. узнікла Ноўгарадская феадальная рэспубліка.

Літ.: Третьяков П. Н. Восточнославянские племена, 2 изд., М., 1953.

ІЛЬМЕНЬ, возера ў Ноўгарадскай вобл. РСФСР. 18 *м* над узр. м. Пл. 982 км² (мяняецца ад 733 да 2089 км² у залежнасці ад ваганняў узр. вады). Даўж. 48 км, найб. шыр. 32 км, найб. глыб. 10 *м*, сярэдняя 2,6 *м*. Пл. вадазбору 67,2 тыс. км². Берагі нізкія, забалочаныя. У І. упадае да 50 прытокаў (Мста, Пала, Ловаць з Палісцю, Шалонь і інш.); выцякае р. Волхаў (каля вытоку г. Ноўгарад). Ледастаў з канца ліст. да канца красавіка. Воз. багатае на рыбу (сняток, лешч, шчупак, мянтуз і інш.). Суднаходства.

ІЛЬНАВО́ДСТВА, галіна сельскай гаспадаркі па вырошчванні *лёну*. З высакаякаснага валакна вырабляюць тканіну, ніткі, спец. адзенне, з валакна ніжэйшага гатунку — мяшочную і ўпаковачную тканіну, вяроўкі, шпагат. З ільнянога семя атрымліваюць алей — каштоўную тэхн. сыравіну, якая ўжываецца ў лакафарбавай, гумавай, электратэхн. і іншай прамысловасці, у медыцыне і як прадукт харчавання. Адход перапрацоўкі лёну — кудзеля — ідзе на ўпакоўку, з кастрыцы вырабляюць тэрмаізаляцыйныя і гукаізаляцыйныя пліты, паперу. Ільняная макуха — корм жывёле. У БССР адна з найважнейшых галін земляробства.

У дарэвалюц. Беларусі лён быў асн. культурай для выробу адзення і гал. таварам бел. экспарту. Найбольш было развіта І. ў Віцебскай губ., на поўначы Магілёўскай і ў паўн.-зах. р-нах Мінскай. У структуры гадавых грашовых паступленняў ад рэалізацыі таварнай прадукцыі с. гасп. даход ад лёну займаў да 30%.

Пасля Кастр. рэв. пл. пад лёнам значна павялічыліся (гл. табл.). БССР сярод саюзных рэсп. па вытворчасці льнопрадукцыі займае 2-е месца. І. дае 15% грашовых даходаў ад рэалізацыі прадукцыі раслінаводства, а ў калгасах да 40% (1970). Найбольш пашырана І. ў Талачынскім, Аршанскім, Горацкім, Карэліцкім, Навагрудскім р-нах. Сяўба і малацьба лёну механізаваны. Праполка робіцца хім. сродкамі, у т. л. з дапамогай сельскагаспадарчай авіяцыі. Механізаваная ўборка і абмалот (гл. *Ільноўборачныя машыны*) скарачаюць многія віды работ (вязанне снапоў, транспартаванне, рассціл). Большая частка льнопрадукцыі перапрацоўваецца на льнозаводах Беларусі (гл. *Ільноапрацоўка, Ільноапрацоўчыя машыны*), з'яўляецца асновай для паспяховага развіцця ў БССР *ільняной прамысловасці*.

СССР па пл. пасеву льну-даўгунцу (1309 тыс. га) займае 1-е месца ў свеце; валавы збор валакна 487 тыс. *т* (1969). Прадзільнае І. пашырана ў нечарназёмных р-нах РСФСР, на Беларусі, Украіне, у Прыбалт. рэспубліках, алейнае — у паўд. р-нах чарназёмнай зоны і ў некат. р-нах засушлівай паласы. У сусв. земляробстве (акрамя СССР) больш пашыраны алейны лён, які займае 3-е месца сярод алейных культур (пасля бавоўніку і сої). Найбольш высяваецца алейнага лёну ў Аргенціне, Індыі, ЗША, Уругваі, Канадзе, а лёну-даўгунцу — у Францыі (2-е месца пасля СССР), Польшчы, Румыніі, Бельгіі, Нідэрландах і інш. краінах.

Літ.: Льноводство, М., 1967; Лён — наше богатство, Мн., 1964; Ковалевский Г. и Русинов А. Вопросы экономики льноводства в колхозах БССР, Мн., 1955.

У. Ф. Тарасевіч. Мінск.

Пасяўныя плошчы, ураджайнасць, валавыя зборы льновалакна і семя на Беларусі

Ва ўсіх катэгорыях гаспадарак	1913	1940	1945	1950	1960	1965	1970
Пасеяна лёну, тыс. га	103,6	274,9	91,4	257,1	270,2	282,3	260,3
Удзельная вага ў структуры пасеваў, %	2,3	5,3	2,4	5,2	4,8	4,7	4,4
Ураджайнасць льновалакна, ц/га	3,2	1,3	1,6	1,6	3,1	4,1	3,9
Ураджайнасць ільносемя, ц/га		1,7	1,9	1,8	2,9	3,5	3,3
Валавы збор льновалакна, тыс. *т*	32,8	36,5	14,9	42,2	84,4	114,4	102,3
Валавы збор семя, тыс. *т*		45,7	17,1	46,8	78,8	98,0	85,2

ІЛЬНОАПРАЦО́ЎКА, апрацоўка льносаломы на валакно. Бывае заводская (валакно атрымліваюць на льнозаводах) і незаводская (льносалому перапрацоўваюць на валакно ў калгасах і саўгасах). У БССР аб'ём заводскай І. складае 75—80%, працуюць 49 ільнозаводаў.

С. гасп. пастаўляе льнозаводам сыравіну ў выглядзе льнотрасты, радзей ільносаломы. У калгасах і саўгасах абмалочаную льносалому рассцілаюць на лугах або на льнішчы. Яна ператвараецца ў трасту ў выніку жыццядзейнасці мікраарганізмаў (аэробных і анаэробных), якія разбураюць сувязь паміж валакністай і драўнінай часткамі сцябла, паміж асобнымі валокнамі. На з-дах ільносалому мочаць у спец. ёмістасцях біял. спосабам. Атрыманую трасту апрацоўваюць на мяльна-трапальных і кудзелепрыгатавальных агрэгатах (гл. *Ільноапрацоўчыя машыны*). Асн. задача мех. апрацоўкі — не пашкодзіць валокны, разбурыць сцябло і аддзяліць валокны ад драўнінавай часткі. У выніку атрымліваецца доўгае і кароткае льновалакно, якое сартуюць, прасуюць і адпраўляюць прадпрыемствам *ільняной прамысловасці*. На Беларусі даследчая работа па І. вядзецца ў НДІ прамысловасці першапачатковай апрацоўкі лубяных валокнаў Мін-ва лёгкай прамысл. СССР. Распрацаваны камбінаваны спосаб мачэння лёну.

Літ.: Дербенев С. И., Лунев И. Я. и Миронов К. М. Технология промышленной биологической мочки лубяного сырья, 2 изд., М., 1968; Марков В. В. Первичная обработка лубяных культур, 2 изд., М., 1969; Яршэвіч А. А. і Вяспалаў М. М. Механізацыя ўборкі і апрацоўкі льну і канапель, Мн., 1958.

У. В. Гуляеў. Мінск.

ІЛЬНОАПРАЦО́ЎЧЫЯ МАШЫ́НЫ, машыны для пачатковай апрацоўкі ільняной трасты, якія аддзяляюць валакно ад кастрыцы і чысцяць яго.

Апрацоўваюць лён на льнозаводах або ў саміх гаспадарках. Для пач. апрацоўкі лёну-даўгунцу выпускаюцца мяльна-трапальныя агрэгаты МТ-100Л, ільнамялкі МЛКУ-6 (раамінаюць трасту, прапускаючы яе праз вальцы), ільнотрапалкі ТЛ-40А (аддзяляюць доўгія валокны ад мятай трасты), трасільныя машыны ТГ-135Л і кудзелепрыгатавальныя машыны КП-100Л, КЛ-25М (выдзяляюць кароткае валакно з адходаў трапальных машын). І. м. ўстанаўліваюцца ў закрытым памяшканні, выкарыстоўваюцца ў агрэгатах. Дзённая прадукцыйнасць пункта першаснай апрацоўкі лёну каля 7 ц валакна, сезоннай — 50 *т*.

Літ.: Барсуков А. Ф. и Еленев А. В. Краткий справочник по сельскохозяйственной технике, М., 1968; Справочник льновода, М., 1969.

ІЛЬНОЎБО́РАЧНЫЯ МАШЫ́НЫ, с.-г. машыны для ўборкі лёну-даўгунцу. У адпаведнасці з спосабамі ўборкі пастаўляюцца комплексы машын: для снаповага і раздзельнага спосабу — ільноцерабілкі, ільномалатарні, ільнорассцілачныя машыны, падборшчыкі трасты, ільнопадборшчыкі-малатарні; для камбайнавага — ільнокамбайны і падборшчыкі трасты. Пры камбайнавай уборцы для сушкі вараху і выдалення з яго насення будуюцца пункты, абсталяваныя ўстаноўкамі для сушкі (ОСВ-60 або УДС-300), агрэгатам падагрэву паветра (ВПТ-400 або ВПТ-600) і машынай, якая раздзяляе вораx і семя (РВ-1,2 або МВ-2,5). У БССР выкарыстоўваюцца ільноцерабілкі ТЛН-1,5 і ЛТ-4, ільномалатарні МЛ-2,8П, ільнорассцілачныя машыны ЛРМ-2, падборшчыкі трасты ПТП-1, ільноўборачныя камбайны ЛКВ-4Т і ЛК-4Т.

Ільноцерабілка вырывае лён і рассцілае яго стужкаю на полі. Франтальная навясная з церабільным апаратам стужачна-дыскавага тыпу



Рыс. 1. Ільноцерабілка навясная ТЛН-1,5.

(ТЛН-1,5, рыс. 1) выкарыстоўваецца для падрыхтоўкі ўчастка лёну да камбайнавай уборкі, прычапная з церабільным апаратам стужачна-ролікавага тыпу (ЛТ-4) ужываецца як асн. машына пры снаповым спосабе ўборкі. ТЛН-1,5 агрэгатуецца з трактарам класа 0,6 *т*. Шырыня захопу 1,52 *м*, рабочая скорасць 6—8 км/гадз, прадукцыйнасць 0,6—0,9 га/гадз. Абслугоўваецца трактарыстам. Ільномалатарня МЛ-2,8П (рыс. 2) прызначана для абмалоту лёну (ачэсванне снапоў зубчастымі граблямі), перацірання галовак, выдалення насення



Рыс. 2. Ільномалатарня МЛ-2,8П.

і папярэдняй яго ачысткі. Выкарыстоўваюцца як перасоўныя (прывод ад трактара класа 0,9—1,4 *т*, абслугоўванне 4—5 чал.) і стацыянарныя (прывод ад эл. рухавіка). Прадукцыйнасць 2—2,5 *т* лёну (у снапах) за гадзіну. Ільнорассцілачная машына ЛРМ-2 рассцілае льносаломку стужкаю таўшчынёю 5—6 *мм*. Складаецца з прычэпа, у які загружаюцца снапы, і прымацаваных да яго двух рассцілачных апаратаў (прыводзяцца ў дзеянне ад хадавых колаў прычэпа). Агрэгатуецца з трактарамі класа 0,9—1,4 *т*, абслугоўваецца 5 чал. Рабочая скорасць 5—6 км/гадз, прадукцыйнасць да 1 га/гадз. Падборшчык трасты ПТП-1 падбірае трасту і звязвае яе ў снапы. Складаецца з падборачнага барабана, вязальнага апарата і транспарцёраў — заціскнога і вынаснога. Агрэгатуецца з трактарамі класа 0,6—0,9 *т*, абслугоўваецца 2 чал. Скорасць 5—7 км/гадз, прадукцыйнасць 0,6—0,8 га/гадз. Ільноўборачны камбайн адначасова цярэбіць і абмалочвае лён, звязвае льносаломку ў снапы (ЛКВ-4Т, рыс. 3) або рассцілае яе на полі



Рыс. 3. Ільноўборачны камбайн ЛКВ-4Т.

(ЛК-4Т), збірае ачэсаныя галоўкі ў прычэп. Агрэгатуецца з трактарам «Беларусь» і прычэпам 2ПТС-4М. Абслугоўваецца трактарыстам і камбайнерам. Скорасць пры рассціланні 10—12 км/гадз, пры вязцы снапоў да 6 км/гадз, шырыня захопу 1,52 *м*. прадукцыйнасць пры рассціланні да 1 га/гадз, пры вязанні снапоў да 0,75 га/гадз.

Літ.: Льноводство, М., 1967; Яршевич А. и Галимский Т. Механизация возделывания и уборки льна, Мн., 1966.

А. А. Яршэвіч. Мінск.

ІЛЬНЯ́НАЯ ПРАМЫСЛО́ВАСЦЬ, галіна тэкстыльнай прамысловасці па вытворчасці з лёну тканін бытавога прызначэння, а таксама тэхн. і тарных тканін, ільняной пражы.

На Беларусі І. п. — адна з самых даўніх галін вытворчасці. Яе вытокі — ад шырока распаўсюджанага сярод сялянства хатняга ткацтва. Ільняныя мануфактуры з'явіліся ў 2-й пал. 18 ст. У 1794 у Шклове засн. прыгонная мануфактура для вытворчасці парусінавага палатна. Да пач. 19 ст. на Беларусі было 25 невял. прадпрыемстваў палатнянай вытворчасці і 1 суконна-палатнянай. У 1900 у Віцебску руска-бельг. акц. т-вам пабудавана лёнапрадзільная ф-ка «Дзвіна», у 1902 у Высачанах Аршанскага пав. засн. лёнапрадзільная ф-ка, якая належала аўстр. капіталу. Было так-

сама многа дробных ф-к. На долю лёнаапрацоўчай галіны прыпадала каля пал. ўсёй валавой прадукцыі тэкстыльнай прамысл. Выраблялася пераважна пража, якая вывозілася на ткацкія ф-кі Цэнтральна-прамысл. р-на Расіі і ў Зах. Еўропу. У 1913 выраб ільняных тканін склаў 0,1% агульнарасійскай вытворчасці.

Хуткаму росту І. п. на Беларусі за гады Сав. улады садзейнічала развіццё *ільнаводства* і *ільнаапрацоўкі*. У 1928—29 пачалося буд-ва першых ільнозаводаў — Дрысенскага (Верхнядзвінскага) і Лёзненскага. Да 1940 было 68 ільнозаводаў. У 1937 стала даваць прадукцыю 1-я чарга *Аршанскага льнокамбіната*, які вырабляў тарную тканіну. Пачала выпускаць тканіну б. лёнапрадзільная ф-ка «Дзвіна» ў Віцебску (пасля Айч. вайны на базе ф-кі пабудаваны дывановы камбінат). У 1940 удз. в. ільняных тканін, выпушчаных у БССР, складала 5,5% агульнасаюзнай вытворчасці. У Айч. вайну прадпр. І. п. разбураны. У 1961 дала першую прадукцыю — тканіну бытавога прызначэння — 2-я чарга Аршанскага льнокамбіната. На базе лёнапрадзільнай арцелі ў Оршы пачала працаваць лёнапрадзільная ф-ка «Дняпро», якая пастаўляе ільняную пражу дывановым прадпрыемствам рэспублікі. У 1970 выпуск ільняных тканін у рэспубліцы ў 4,7 раза перавысіў узровень 1940 (гл. табл.). БССР па вытворчасці ільняных тканін займае 2-е месца ў СССР. Асвоены выраб тканін з лёну і хім. валокнаў. Каля 60% ільновалакна з Беларусі вывозіцца ў інш. эканам. раёны СССР. У 1971—75 намечана закончыць буд-ва 3-й чаргі Аршанскага льнокамбіната, пачаць буд-ва Асіповіцкага льнокамбіната па вытворчасці быт. тканін.

Вытворчасць ільняных тканін (млн. м²)

	1940	1950	1960	1965	1970
СССР	268,3	257,4	516,1	548,0	707
БССР	15,8	18,7	54,3	64,3	73,8

Па выпуску ільняных тканін СССР належыць 1-е месца ў свеце. Найб. буйныя камбінаты ільняной прамысл. СССР: Аршанскі, Якаўлеўскі, «Зара савенскі, Валагодскі, Смаленскі, 2 Кастрамскія — імя Леніна і імя Звярыкіна. З сацыяліст. краін больш развітую прамысл. маюць Польшча, Чэхаславакія, Венгрыя. Гл. таксама *Лёгкая промышленность*.

Літ.: Легкая промышленность Белоруссии за 50 лет Советской власти, Мн., 1967; Специализация и кооперирование в легкой промышленности Белорусской ССР, Мн., 1963; Экономика Советской Белоруссии 1917—1967, Мн., 1967; Народное хозяйство Белорусской ССР за 40 лет, Мн., 1957; Пажитнов К. А. Очерки истории текстильной промышленности дореволюционной России, М., 1958.

В. А. Мухіна. Мінск.

ІЛЬНЯНАЯ ТКАНІНА, тканіна, якая вырабляецца з ільняной пражы палатняным перапляценнем. Пры ўключэнні ў аснову ці ўток баваўняных або хім. валокнаў (гл. *Валокны тэкстыльныя*, *Валокны хімічныя*) тканіна наз. паўільняной.

Адметныя ўласцівасці І. т.— высокая трываласць і гідрафільнасць, г. зн. здольнасць паглынаць вільгаць пры адносна высокай паветра- і цеплапранікальнасці, а таксама стойкасць супраць гніення. І. т. вызначаюцца дабротнасцю, павышанай шчыльнасцю і цвёрдасцю, якія іншы раз узмацняюцца *апрацаваннем*. Вельмі носкі і пры намочванні дае малую ўсадку. Выпрабляюць І. т. суравыя, адвараныя, кіславаныя і адбеленыя (гл. *Аддзелка тканін*). Паводле прызначэння і структуры І. т. бываюць сталовыя адамашкавыя (абрусы, сурвэткі), ручніковыя адамашкавыя, махрыстыя і гладкія, касцюмна-плаццевыя і бялізнавыя, тэхнічныя (парусіны брызентавыя, пакавальныя і мяшочныя і г. д.). Самае буйное прадпрыемства на Беларусі па выпрабе І. т.— *Аршанскі льнокамбінат*. Па вытворчасці І. т. БССР займае 2-е месца ў СССР. Гл. таксама *Льняная промысловасць*.

Літ.: Трегубова Б. Л. и Фридман Е. М. Производство и потребление льняных тканей в СССР и зарубежных странах. (Обзор), М., 1969; Цвелодуб В. П. Совершенствование структуры ассортимента льняных тканей, Мн., 1969.

ІЛЬФ Ілья [сапр. Файнзільберг Ілья Арнольдавіч; 3(15).10.1897, Адэса — 13.4.1937], рускі савецкі пісьменнік-сатырык. З служачых. У 1913 скончыў тэхн. школу. Друкавацца пачаў (фельетоны, нарысы) у 1923 у газ. «Гудок», час. «Смехач», «Красный перец» і інш. З 1927 пісаў разам з Я. *Пятровым*. У раманах «Дванаццаць крэслаў» (1928) і «Залатое цяля» (1931) сатырычна выкрываецца мяшчанскі «маленькі свет» і проціпастаўляецца яму велічная рэвалюц. ява. Разам напісалі аповесць «Светлая асоба» (1928), цыкл сатыр. павел «1001 дзень, ці Новая Шэхеразада» (1929), раман «Аднапавярховая Амерыка» (1936), шмат фельетонаў.

Тв.: (З Я. Пятровым) Собр. соч., т. 1—5, М., 1961; Записные книжки, 2 изд., М., 1957; бел. пер.— Аднапавярховая Амерыка, Мн., 1938.

Літ.: Галанов В. Илья Ильф и Евгений Петров, М., 1961; Яновская Л. Почему вы пишете смешно?, М., 1969.

ІЛЬЮЧЫК Сцепаніда Піліпаўна [н. 18(31).7.1912, в. Скібічы Кобрынскага пав. Гродзенскай губ.], перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1958). Чл. КПСС з 1957. У 1950—63 свінарка калгаса імя Жданава Драгічынскага р-на Брэсцкай вобл. Дэп. Вярх. Савета БССР 4—5-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам «Мацярынская слава» 3-й ступені. Жыве ў Драгічыне Брэсцкай вобл.

ІЛЬЮШЫН Іван Макаравіч [н. 1(14).7.1903, в. Пракшэнічы Магілёўскага пав.], беларускі савецкі філосаф, дзяржаўны дзеяч БССР. Чл.-кар. АН БССР (1950). З сялян. Чл. КПСС з 1930. Скончыў БДУ (1930). У 1932—38 старшы навук. супрацоўнік, вучоны сакратар Ін-та філасофіі АН БССР. Адначасова выкладчык дыялект. і гістар. матэрыялізму ў ВНУ Мінска. У 1937—41 заг. кафедры марксізма-ленінізма Бел. ін-та фізічнай культуры. З пач. Айч. вайны на парт. і выкладчыцкай рабоце ў Узб. ССР. У 1943—47 нам. заг. аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б, нам. старшыні Савета Міністраў БССР. У 1947—51 дырэктар Ін-та філасофіі і права АН БССР, гал. рэдактар час. «Бальшавік Беларусі», гал. вучоны сакратар Прэзідыума АН БССР. У



1951—61 міністр асветы БССР. З 1964 заг. кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі і навук. камунізма Мінскага радыётэхнічнага ін-та. Даследуе праблемы пралет. інтэрнацыяналізму, марксісцка-ленінскай тэорыі пазнання, грамадска-паліт. думкі, нар. адукацыі і культуры Беларусі. На XX—XXIV з'ездах КПБ выбіраўся чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета БССР 2—5-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, 3 інш. ордэнамі, медалямі.

Тв.: (З С. Я. Вальфсонам) Аб пралетарскім інтэрнацыяналізме ў нацыянальна-каланіяльным пытанні, Мн., 1935; Аб некаторых пытаннях гісторыі грамадскай думкі на Беларусі, «Бальшавік Беларусі», 1948, № 6; Развитие В. И. Лениным теории познания диалектического материализма, «Известия АН БССР», 1949, № 3; Народная асвета ў Беларусі за гады Савецкай улады, Мн., 1957; Ленінская канцэпцыя пралетарскага інтэрнацыяналізму, «Весці АН БССР. Сер. грамадскіх навук», 1970, № 2; Ленінскі прынцып самавызначэння нацый і ўтварэнне БССР, там жа, 1971, № 2.

ІЛЬЮШЫН Сяргей Уладзіміравіч [н. 18(30).3.1894, с. Дзілялёва Валагодскай губ.], савецкі авіяканструктар. Акад. АН СССР (1968), ген.-палк. інж.-тэхн. службы. Двойчы Герой Сац. Працы (1941, 1957). Чл. КПСС з 1918. Скончыў Ваенна-паветраную інж. акадэмію імя Жукоўскага (1926). У авіяцыі з 1916. У 1919—21 у Чырв. Арміі. У 1926—31 працаваў у навук.-тэхн. камітэце ВПС. З 1931 на канструктарскай рабоце. Прафесар Ваенна-паветранай інж. акадэміі імя Жукоўскага (з 1948). Пад кіраўніцтвам І. створаны самалёты-штурмавікі, бамбардзіроўшчыкі, якія шырока ўжываліся ў Айч. вайне 1941—45, адзін з першых рэактыўных самалётаў ІЛ-28 (1948), пасажырскія: магамесныя ІЛ-14 (1954), ІЛ-18 (1957), транскантынентальны ІЛ-62 (1962). Дэп. Вярх. Савета СССР 1—7-га скл. Дзярж. прэміі СССР 1941, 1942, 1943, 1946, 1947, 1950, 1952 і Ленінская прэмія 1960. Узнаг. 6 ордэнамі Леніна, інш. ордэнамі і медалямі.



ІЛЬЮШЫНА, вёска ў Жарскім с/с Ушацкага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Дружба». За 10 *км* на Пд ад Ушачаў, 150 *км* ад Віцебска, 29 *км* ад чыг. ст. Лепель. 169 ж., двароў 64 (1970). Пач. школа, клуб, б-ка.

ІЛЬЯ, старазапаветны біблейскі прарок, які ўшаноўваўся як божышча. З хрысціянізацыяй Русі вобраз І. ўвабраў у сябе рысы ўсходнеславянскага бога *Перуна*.

У бел. міфалогіі, дагуіх вераваннях і фальклоры І.— распарадчык дажджоў і навальніц, які раз'язджае па небе ў агненнай або залатой калясніды; апякун земляробства, абаронца ад «нячыстай сілы». У народным календары І. (20 ліп. ст. ст.) азначаў канец лета, пачатак пахаладанняў, дажджоў: «Ілья нарабіў гнілля», «Ілья ўкінуў лядня», «Прыйшоў Пятрок — апаў лісток, прыйшоў Ілья — апалі два».

ІЛЬЯ, вёска ў Вілейскім р-не Мінскай вобл., на р. Ілія. Цэнтр сельсавета. За 35 *км* на ПдУ ад Вілейкі, 75 *км* ад Мінска, 29 *км* ад чыг. ст. Уша, на аўтамаб. дарозе Сосенка — Краснае. 2179 ж., двароў 530 (1971). Смалакурны і цагельны з-ды, лясніцтва, камбінат быт. абслугоўвання. Вет. тэхнікум, сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, дзіцячыя яслі і сад, бальніца, аптэка, вет. лячэбніца, аддз. сувязі, 10 магазінаў. Помнік на брацкіх могілках 750 сав. грамадзян, якіх 17.3 і 6.4.1942 загубілі ням.-фаш. захопнікі. У ліп. 1944 ням.-фаш. карнікі спалілі вёску.

ІЛЬЯ МУРАМЕЦ, герой былін і казак на сюжэты былін. Некат. сюжэты пра яго, напр. «Ілья і Салавей-разбойнік», ідуць ад Ст. Русі; іншыя («І. М. і Калін-цар») — ад эпохі тат.-манг. нашэсця. Пазней склалася «казачная» быліна «Тры паездкі Ільі». Стагоддзямі фарміраваўся і вобраз асілка, уладкавальніка і абаронцы зямлі рускай — паэт. абагульненне нар. вопыту.

Шэраг вучоных звязвае ўзнікненне асобных былін пра І. М. з Беларуссю (В. Пархоменка, С. Шамбінага, А. Маркаў, У. Мілер, М. Пятроў). Гіпотэзу пра адлюстраванне ў быліне «Ілья і Салавей-разбойнік» полацка-кіеўскіх адносін 11 ст. абгрунтаваў Пархоменка ў кн. «Ля вытокаў рускай дзяржаўнасці» (Л., 1924). У пісьме 1574 аршанскага старосты Кміты-Чарнабыльскага імя асілка Ілы ўспамінаецца як назыўное. Гэта сведчыць пра папулярнасць на Беларусі 16 ст. калі не песеннага эпасу, дык казак пра І. М. Самыя стараж. «сказанні» пра І. М. (17—18 ст.) выяўляюць сляды зах.-рус. і бел. паходжання. Бел. казкам пра І. М. характэрны «сплаў» матываў былін з легендамі пра асілкаў. Адгалоскі былін пра І. М. ёсць у некат. бел. нар. песнях.

Літ.: Илья Муромец. Подгот. текстов, ст. и коммент. А. М. Астаховой, М.— Л., 1958; Беларускі эпас, Мн., 1959; Шамбінага С. Аб бытаванні народнага эпасу ў Беларусі, «Беларусь», 1945, № 1; Астахова А. М. Былины. Итоги и проблемы изучения, М.— Л., 1966; Кабашников К. П. Традиции героического эпоса в белорусском народном творчестве, у кн.: Основные проблемы эпоса восточных славян, М., 1958; Бараг Л. Р. Белорусская казка, Мн., 1969; Плужникова С. Былинное наследие белорусского сказочного эпоса, «Известия АН СССР. Сер. лит. и языка», 1965, т. 24, в. 6.

Л. Р. Бараг. Уфа.

ІЛЬЯШЭНКА Кірыла Фёдаравіч [н. 14(27).5.1915, с. Лепецкае Ананьеўскага пав. Херсонскай губ.], савецкі дзярж. дзеяч. З сялян. Чл. КПСС з 1945. Скончыў Ціраспальскі пед. ін-т (1939). У 1939—40 супрацоўнік рэдакцыі газ. «Молдова Сочиалиста» («Сацыялістычная Малдавія»). З 1940 у Чырв. Арміі. У 1945—46 на журналісцкай рабоце, з 1946 у апараце ЦК КП Малдавіі, з 1962 старшыня Дзярж. к-та Савета Міністраў Малд. ССР па каардынацыі н.-д. работ, нам. старшыні Савета Міністраў Малд. ССР. З крас. 1963 старшыня Прэзідыума Вярх. Савета Малд. ССР, нам. Старшыні Прэзідыума Вярх. Савета СССР (з 1966). На XXIII з'ездзе КПСС выбраны чл. Цэнтр. рэвізійнай камісіі, на XXIV — канд. у чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета СССР 7, 8-га скл. Узнагароджаны 3 ордэнамі, медалямі.



ІЛЮВІЙ, ілювіяльны гарызонт (ад

лац. illuvies разліў, намыўная гразь), мінеральныя часцінкі, якія вымываюцца пры прасочванні вады праз глебу і намнажаюцца пераважна ў ніжніх гарызонтах глебы. У падзолістых глебах намнажаюцца гліністыя часцінкі, вокіслы алюмінію і жалеза, гумус; у стэпавых — ванна, гіпс і інш. солі.

ІЛЮЗІЯ (лац. illusio падман, заблуджэнне), скажонае ўспрыманне рэчаіснасці. Адрозніваюць І., якія ўзнікаюць у выніку пэўных законаў адчуванняў і ўспрыманняў ва ўсіх або ў большасці людзей (напр., светлыя прадметы здаюцца большымі ў параўнанні з аднолькавымі па велічыні цёмнымі); І., якія ўзнікаюць у выніку псіхафізіял. стану пэўнага чалавека, яго павышанай эмацыянальнай узбуджальнасці, напружанага чакання, наяўнасці якіх-н. пазойлівых уяўленняў. І. трэба адрозніваць ад *галюцынацыі*.

ІЛЮЗІЯНІЗМ (ад франц. illusionner уводзіць у падман), 1) від цыркавога мастацтва, у якім выкарыстоўваецца з'ява *ілюзіі* для дэманстрацыі паняўленняў, ператварэнняў, перамяшчэнняў рэчаў, людзей, жывёл. Трансфармацыі здаюцца незвычайнымі, звышнатуральнымі, а ў сапраўднасці пабудаваны на падмане зроку.

Для паказаў выкарыстоўваюць спец. апаратуру — скрынкі з падвойным дном, патайныя спружыны і г. д., сучасную электронную тэхніку. І. бярэ пачатак у стараж. мастацтве фокуснікаў. На Беларусі ў 1-й пал. 19 ст. ў в. Семежава (Капыльскі р-н Мінскай вобл.) існавала нар. школа фокуснікаў; таксама былі фокуснікі ў бел. цыркавой трупе Даўгялы. Сярод вядомых сав. ілюзіяністаў Э. Кіо, З. Тарасава, А. Сокал, Н. Рубанава, з беларускіх А. *Шаг-Наважылаў*.

2) У выяўл. мастацтве — трактоўка, разлічаная на вонкавую праўдападобнасць, што мяжуе з ілюзіяй (падманам зроку), а таксама тэрмін для характарыстыкі натураліст. падыходу да выявы, разлічанага на перадачу знешн. выгляду замест сутнасці і сэнсу з'явы.

ІЛЮМІНА́ЦЫЯ (лац. illuminatio асвятленне), яркае асвятленне будынкаў, вуліц, паркаў і інш., часам з выкарыстаннем каляровых агнёў. Звычайна прымяркоўваецца да ўрачыстасцей і свят.

ІЛЮСТРА́ЦЫЯ (лац. illustratio асвятленне, выява), выява, што паясняе які-н. тэкст з дапамогай прыкладаў або вобразаў. У навук. і навучальнай л-ры І. з'яўляюцца фотаздымкі, малюнкі, рэпрадукцыі, карты, схемы і г. д. Маст. І. вобразна раскрывае змест літ. твора і з'яўляецца асобным відам выяўл. мастацтва, гал. чынам *графікі*.

Першымі І. былі малюнкі ў стараж. рукапісах, у сярэднія вякі — *мініяцюры*. Масаваму пашырэнню І. ў 19 ст. садзейнічала вынаходства тарцовай гравюры, літаграфіі і, асабліва, фотамеханічнай рэпрадукцыі. У галіне І. працавалі мастакі Германіі (А. Дзюрэр, Г. Гольбейн, А. Менцэль), Францыі (А. Фраганар, Э. Дэлакруа, А. Дам'е, Г. Дарэ, Т. А. Стэйнлен, П. Пікасо, А. Матыс), ЗША (Р. Кент), Расіі (Ф. Талстой, А. Агін, П. Баклеўскі, В. Васняцоў, А. Паленава, П. Сакалоў, М. Урубель, А. Бенуа, М. Дабужынскі). І. на тэр. Беларусі бярэ пачатак у старажытнарус. кніжнай мініяцюры (Радзівілаўскі летапіс, 13 ст.). З развіццём ваходнеславянскага кнігадрукавання І. належала значнае месца ў афармленні бел. кніг (дзейнасць Ф. Скарыны, С. Буднага, П. Мсціслаўца, І. Фёдарава, М. і В. Вашчанкаў, Ф. Англейкі). У 19 — пач. 20 ст. ў кніжнай графіцы працавалі В. Ваньковіч, І. Аляшкевіч, К. Бахматовіч, А. Бартэльс, С. Богуш-Сестранцэвіч, К. Кастравіцкі, у 30-я г. ў Зах. Беларусі — Я. Драздовіч. У сав. час ілюстратары імкнуцца да глыбокага раскрыцця ідэйнага зместу літ. твораў, дакладнага паказу іх гістар., нац., стылістычных асаблівасцей, да праўдзівасці і яркасці сац.-псіхал. характарыстыкі герояў (Я. Лансерэ, Дз. Кардоўскі, В. Кустодзіеў, У. Фаворскі, Кукрыніксы, Дз. Шмарынаў, Я. Кібрык, М. Жукаў, С. Кабуладзе, А. Канеўскі, В. Юркунас і інш., у БССР Э. Агуновіч, Л. Асецкі, А. Астаповіч, В. Бароўка, У. і М. Басалыгі, М. Гуцеў, І. Давідовіч, А. Даламарын, П. Драчоў, В. Забораў, Ю. Зайцаў, С. Кавалёў, А. Кашкурэвіч, Я. Кулік, А. Лось, А. Луцэвіч, М. Малевіч, Б. Малкін, Г. і Н. Паплаўскія, А. Паслядовіч, В. Тарасаў, В. Шаранговіч і інш.).

Іл. гл. на ўклейках I—IV да гэтага арт. і да арт. *Гравюра, Графіка, Літаграфія*.

Літ.: Лебедев Г. Е. Русская книжная иллюстрация XIX в., М., 1952; Чегодаев А. Д. Пути развития русской советской книжной графики, М., 1955; Ганкина Э. З. Русские художники детской книги, М., 1963; Громов В. А. и Гудков Г. А. Иллюстрации в технической книге, М.— Л., 1960; гл. таксама літ. пры арт. *Гравюра* і *Графіка*.

ІЛЯМНІЦКІ (Ilemnický) Петар (18.3.1901, г. Кішперк — 19.5.1949), славацкі пісьменнік, адзін з заснавальнікаў сацыяліст. рэалізму ў славацкай л-ры. Чл. КПЧ з 1921. Нар. мастак (1949). Дэбютаваў апавяданнямі ў камуніст. друку (1920). У 1926—28 жыў у СССР (зб. рэпартажаў «Два гады ў Краіне Саветаў», 1929; раман «Звонкі крок», 1930). У раманах «Пераможны крах» (1929), «Поле неўзаранае» (1932), «Кавалак цукру» (1934) адлюстравана класавая барацьба ў Чэхаславакіі. На матэрыяле сав. і славацкай рэчаіснасці напісаў кнігу павел «Компас у нас» (1937). У 1942 за ўдзел у антыфаш. руху кінуты ў канцлагер; у рамане «Хроніка» (1947) апісаў падзеі славацкага антыфаш. паўстання 1944.

Тв.: Бел. пер.— у час. «Маладзік», 1931, № 4; рус. пер.— Хроника, М., 1948; Кусок сахару, М., 1950; Поле невспаханное, М., 1955.

Літ.: Петер Илемницкий. Биобиблиогр. указатель, М., 1960. *А. В. Мажэйка.* Мінск.

ІМАБІЛІЗА́ЦЫЯ (лац. immobilis нерухомы), спосаб стварэння нерухомасці (спакою) пашкоджанаму ўчастку цела. Ужываецца пераважна пры траўмах (пераломах касцей, пашкоджаннях мяккіх тканак) і хваробах апорна-рухальнага апарата (астэаміэліце, туберкулёзе). Каб І. была эфектыўная, пры пераломах фіксуюць два суставы — вышэй і ніжэй пералому.

І. падзяляюць на транспартную (часовую) і лячэбную (пастаянную). Для транспартнай выкарыстоўваюць спец. прыстасаванні — драцяныя, фанерныя, пластмасавыя шыны, падручныя сродкі — палкі, дошкі або прыбінтоўваюць пашкоджаную руку да грудной клеткі, нагу — да здаровай нагі. Пастаянная робіцца гіпсавымі павязкамі, выцяжэннем і хірург. аперацыямі. І. вядома са старажытнасці. Для лячэння пераломаў беларускі ўрач К. І. Гібенталь выкарыстаў у 1812 гіпс. Гіпсавую павязку ў час Крымскай вайны (1854—55) ужыў рус. хірург М. І. Пірагоў.

Літ.: Напалков П. Н., Смирнов А. В. и Шрайбер М. Г. Хирургические болезни, 2 изд., Л., 1968; Новаченко Н. П. Ортопедия и травматология, 2 изд., М., 1965; Многотомное руководство по хирургии, т. 11—12, М., 1960—61.

Ф. С. Анцыпяровіч. Мінск.

ІМАВЕ́РНАСНАЯ ЛО́ГІКА, тэорыя *многазначных логік*, якая вывучае імавернасці іспіннасці выказванняў (ступень іспіннасці, ступень пацвярджэння), разглядаючы іх як уласцівасці выказванняў у прамежку паміж іспіннасцю і ілсіспіннасцю. Калі абазначыць іспіннасць праз *1*, а ілсіспіннасць праз *0*, то імавернасныя значэнні выказванняў могуць быць выражаны ўсімі сапраўднымі лікамі паміж *0* і *1*.

Пры вылічэнні імавернасцей ужываюць апарат двухзначных (па адзнацы іспіннасці — ілсіспіннасці) лагічных вылічэнняў, бо ацэнка імавернасцей можа быць зведзена да ацэнкі іспінных або ілсіспінных выказванняў (гл. *Вылічэнне выказванняў* і *Вылічэнне прэдыкатаў*). Усякае выказванне разглядаецца як гіпотэза, пакольк яно нанава ўводзіцца і патрабуе эксперымент. праверкі. Імавернасць (*p*) гіпотэзы ёсць функцыя ад двух аргументаў: самой гіпотэзы (*h*) і наяўных ведаў (*k*), якія не абгрунтоўваюць. Калі *h* лагічна вынікае з *k* і *k* — іспінае, то і *h* будзе іспінае. Вылічэнне *p* складаецца з гіпотэзы, калі вядомыя *p* выказванняў, што ўваходзяць у яе структуру, ва ўсіх сістэмах І. л. ажыццяўляецца па правілах вылічэнняў у *імавернасцей тэорыі*. У такім выпадку І. л. выступае як адна з інтэрпрэтацый тэорыі імавернасцей і дае магчымасць ужываць стат. метады і апаратары тэорыі імавернасцей да ацэнкі гіпотэз. Аднак, пакольк у І. л. выражаць імавернасці дакладным лікам не заўсёды абавязкова, вынікі прымаюцца як прыблізная ацэнка гіпотэз. У сувязі з тым, што элементарныя выказванні-гіпотэзы пры ацэнцы складаных гіпотэз патрабуюць эксперымент. праверкі, І. л. вмыкаецца ў *індукцыйнай логікай*. Ідэі І. л. ёсць у Арыстоцеля, які даследаваў імавернасці пасылак сілагізму, але да ўзнікнення тэорыі імавернасцей яна не мела ясна акрэслених задач. У 17 ст. тэорыя імавернасцей узнікла як тэорыя масавых выпадковасцей, а ў сярэдзіне 19 ст. з яе вылучылася І. л. Сучаснае развіццё І. л. непасрэдна звязана з дасягненнямі *матэматычнай логікі*.

Літ.: Пятницын Б. Вероятностная логика, у кн.: Философская энциклопедия, т. 1, М., 1960; Пойа Д. Математика и правдоподобные рассуждения, пер. с англ., М., 1957.

П. Дз. Пузікаў. Мінск.

ІМАВЕ́РНАСЦЕЙ ТЭО́РЫЯ, матэм. тэорыя, якая вывучае імавернасці выпадковых падзей і дае магчымасць вызначыць імавернасці складаных падзей праз імавернасці простых, калі вядома, як складаныя падзеі з іх састаўлены. Асноўны аб'ект вывучэння І. т.— паслядоўнасці і сямействы выпадковых велічынь. І. т. будуецца на аснове *многстваў тэорыі* і тэорыі меры. Гэты падыход распрацаваны А. М. *Калмагоравым* і лічыцца агульнапрынятым. Шмат якія фундаментальныя тэарэмы І. т. ўстанавілі рус. і сав. матэматыкі: П. Л. Чабышоў, М. А. Маркаў, А. М. Ляпуноў, С. Н. Бернштэйн, А. М. Калмагораў, А. Я. Хінчын, Ю. У. Лінник. І. т. выкарыстоўваецца ў *статыстычнай фізіцы, матэматычнай статыстыцы, імавернаснай логіцы*, а таксама ў біялогіі, ваеннай справе (тэорыя стральбы), астраноміі (тэорыя памылак назіранняў), тэхніцы і ў інш. галінах.

Зыходныя паняцці І. т.— паняцці выпадковай падзеі і не *імавернасці*. Падзеі рэчаіснасці, якія адбываюцца пры пэўных умовах, можна падзяліць на тры катэгорыі: дакладныя — заўсёды адбываюцца, немагчымыя — ніколі не адбываюцца, выпадковыя — часам адбываюцца, а часам не. З двух выпадковых падзей *A* і *B* можна ўтварыць складаныя падзеі: аб'яднанне (суму) $A \bigcup B$ — { адбудзецца ці *A*, ці *B* }, перасячэнне (здабытак) $A \bigcap B$ — {адбудуцца і *A* і *B*}, рознасць $A \setminus B$ — { адбудзецца *A*, але не адбудзецца *B*}. Выкарыстоўваючы гэтыя аперацыі над дзвюма ці больш падзеямі, атрымліваюць складаныя падзеі. Мяркуецца, што для кожнай выпадковай падзеі *A* вызначана імавернасць — лік $P(A)$, які задавальняе ўмовам: 1) $P(A) \geq 0$; 2) калі падзеі *A* і *B* не могуць адбыцца адначасова, тады $P(A \bigcup B) = P(A) + P(B)$; 3) імавернасць дакладнай падзеі роўна 1. У прасцейшых выпадках гэтыя ўмовы відавочныя; у агульным выпадку яны прымаюцца без доказу (аксіёмы). Па фармальных (матэм.) правілах атрымліваюць шэраг тэарэм пра імавернасці складаных падзей. Калі ажыццяўленне падзеі *A* не залежыць ад таго, адбудзецца ці не падзея *B*, тады *A* і *B* — незалежныя падзеі. Імавернасць $P(A \bigcap B)$ сумеснага ажыццяўлення дзвюх незалежных падзей *A* і *B* роўна $P(A)\,P(B)$. Калі больш чым дзве выпадковыя падзеі незалежныя, тады імавернасць сумеснага ажыццяўлення кожнай падгрупы з гэтых падзей роўна здабытку імавернасцей падзей з падгрупы. Напр., калі *A*, *B*, *C* — незалежныя, тады $P(A \bigcap B \bigcap C) = P(A)\,P(B)\,P(C)$, $P(A \bigcap B) = P(A)\,P(B)$, $P(A \bigcap C) = P(A)\,P(C)$, $P(B \bigcap C) = P(B)\,P(C)$. Імавернасць $P_n(m)$ таго, што ў серыі з *n* незалежных назіранняў выпадковай падзеі *A* з $P(A) = p$ ($p \neq 0, 1$) гэта падзея адбудзецца *m* разоў, роўна $C_n^m p^m q^{n-m}$, дзе C_n^m — лік спалучэнняў з *n* элементаў па *m*, $q = 1 - p$. Важны клас тэарэтыка-імавернасных тэарэм складаюць граніцныя тэарэмы, якія даюць магчымасць прыбліжна вылічыць складаныя выразы імавернасцей з дапамогай простых асімптатычных формул. Прасцейшыя і гістарычна першыя граніцныя тэарэмы адносяцца да прыведзенага вышэй прыкладу і ўстанаўліваюць наступнае:

1) калі $n \to \infty$, то $P_n(m) \sim \frac{1}{\sqrt{2\pi npq}} e^{-\frac{x^2}{2}}$, дзе $x = \frac{m - np}{\sqrt{npq}}$ пры змене *m* і *n* павінен заставацца ў граніцах фіксаванага інтэрвалу; 2) калі μ_n — лік ажыццяўленняў з'явы *A* ў серыі з *n* незалежных назіранняў, то для кожных фіксаваных лікаў $a, b\,(a < b)$ пры $n \to \infty$ $P\left\{a < \frac{\mu_n - np}{\sqrt{npq}} < b\right\} \to \frac{1}{2\pi} \int_a^b e^{-\frac{x^2}{2}}\,dx$.

Першая — лакальная граніцная, другая — інтэгральная граніцная тэарэмы Муаўра — Лапласа. Да класа граніцных тэарэм адносяцца таксама розныя тэарэмы, аб'яднаныя *вялікіх лікаў законам*. З адной ці з некалькімі выпадковымі падзеямі можа быць звязана некат. функцыя (т. зв. выпадковая велічыня), сутнасць якой вызначаецца вынікамі гэтых выпадковых падзей. Напр., вызначаная раней μ_n — выпадковая велічыня. Няхай выпадковая велічыня ξ прымае значэнні $r_1, r_2, \ldots, r_k$ з імавернасцямі адпаведна $p_1, p_2, \ldots, p_k$. Лік $E\xi = r_1p_1 + r_2p_2 + \ldots + r_kp_k$ — сярэдняе значэнне выпадковай велічыні. Значэнне і сэнс гэтай лікавай характарыстыкі выпадковай велічыні ξ становіцца вразумелым з наступнага: калі ў серыі з *n* назіранняў над ξ значэнне r_1 ажыццявілася n_1 разоў, $r_2 = n_2, \ldots, r_k = n_k$, то сярэдняе арыфметычнае ўсіх значэнняў будзе $\frac{r_1n_1 + r_2n_2 + \ldots + r_kn_k}{n} = r_1p_1 + r_2p_2 + \ldots + r_kp_k$, бо лікі $\frac{n_1}{n}, \frac{n_2}{n}, \ldots, \frac{n_k}{n}$ адпаведна закону вялікіх лікаў блізкія да $p_1, p_2, \ldots, p_k$, калі *n* даволі вялікае.

Літ.: Вентцель Е. С. Теория вероятностей, 4 изд., М., 1969; Гнеденко Б. В. Курс теории вероятностей, 5 изд., М., 1969; Колмогоров А. Н. Основные понятия теории вероятностей, М.— Л., 1936; Лоэв М. Теория вероятностей, пер. с англ., М., 1962. *У. Г. Спрынджук.* Мінск.

ІМАВЕ́РНАСЦЬ, магчымасць ажыццяўлення чаго-небудзь. Тэрмін выкарыстоўваецца ў матэматыцы (гл. ніжэй) і ў *імавернаснай логіцы*.

ІМАВЕ́РНАСЦЬ (у матэматыцы), лік, які характарызуе магчымасць ажыццяўлення выпадковай падзеі ў пэўнай масавай з'яве. Фактычны сэнс І. раскрываецца *вялікіх лікаў законам* і *імавернасцей тэорыяй*.

У прасцейшым выпадку І. вызначаецца адносінамі ліку «спрыяльных выпікаў» да ліку «ўсіх магчымых выпікаў», які мяркуецца быць канечным. Напр., І. таго, што пры адначасовым кіданні дзвюх фішак выпадзе сума ў 10 ачкоў, роўна $^1/_{12}$, бо «спрыяльнымі выпікамі» будуць наступныя тры: (4, 6), (5, 5), (6, 4), у той час, як «усіх магчымых выпікаў» 36. Аналагічны падыход выкарыстоўваецца ў выпадку бесканечных лікаў «спрыяльных выпікаў» і «ўсіх магчымых выпікаў». Напр., пры выпадковым пападанні пункта ў некат. вобласць на плоскасці І. вызначаецца адносінамі плошчы «спрыяльнай вобласці» да пл. той вобласці, куды пункт абавязкова пападзе. *У. Г. Спрынджук.* Мінск.

ІМА́ГА (лац. imago вобраз), апошняя фаза ў развіцці насякомых (дарослае насякомае). Ужываецца таксама як назва стадыі полавай спеласці кляшчоў. Параўн. *Лічынка, Кукалка.*

ІМАНЕ́НТНАЕ (ад лац. immanens уласцівы чаму-небудзь), тэрмін, які ў філасофіі І. Канта абазначаў у адрозненне ад трансцэндэнтнага знаходжанне чаго-н. у самім сабе. Шырока выкарыстоўваецца сучаснай бурж. ідэаліст. філасофіяй. Прадстаўнікі іманентнай філасофіі лічаць аб'ектыўны свет унутраным зместам свядомасці (боскай ідэі або свядомасці індывіда).

ІМБЕЦЫЛЬНАСЦЬ, форма разумовай недаразвітасці. Гл. *Алігафрэнія.*

ІМГЛА́ (сухі туман), памутненне паветра ад мноства цвёрдых калоідных часцінак (дым, гар, пыл).

Гэтыя *аэразолі* ўтрымліваюцца пераважна ў ніжніх слаях атмасферы і пагаршаюць бачнасць да сотняў і дзесяткаў метраў. І. бывае ў пустынных і стэпавых раёнах ад эрозіі глебы і пыльных бур, пры лясных пажарах і над прамысл. гарадамі. І. можа выклікаць *алергію* ў чалавека.

ІМЁННЫЯ КЛА́СЫ, граматычная групоўка імёнаў, аб'яднаных аднолькавымі паказчыкамі (звычайна прэфіксамі) пэўнага граматычнага значэння. Блізкія да катэгорыі грамат. роду ў індаеўрап. і семіцкіх мовах.

Найпрасцейшая сістэма І. к.— два класы: назвы разумных істот і ўсе іншыя назвы (табасаранская мова, Дагестан). У некат. мовах больш за 20 І. к. (мова банту). У аснове класіфікацыі розныя прыметы: велічыня, форма прадметаў і месца іх у прасторы; назвы дзікіх і свойскіх жывёл, прылад працы, сродкаў перамяшчэння, раслін і інш. Крывыя некат. каўказскім і афр. мовам, мовам індзейцаў Амерыкі. Паводле марфалагічнай класіфікацыі гэтыя мовы аглюцінатыўнага тыпу.

М. Р. Каваленка. Мінск.

ІМЕРСІ́ЙНЫ МЕ́ТАД (ад лац. immersio апусканне), вызначэнне паказчыкаў пераламлення святла цвёрдых празрыстых рэчываў пры апусканні іх у вадкасці або сплавы з вядомым паказчыкам пераламлення. Неабходны пры вывучэнні мінералаў, горных парод і тэхнічных камянёў.

І. м. шырока ўжываецца пры мінералагічных і петраграфічных даследаваннях пад мікраскопам верхніх мінералаў дыяметрам ад 0,01 да 0,25 *мм*. Існуюць спец. наборы стандартных імерсійных вадкасцей з паказчыкамі пераламлення ад 1,404 да 2,050. Пры вызначэнні больш высокіх паказчыкаў пераламлення ўжываюцца імерсійныя сплавы.

Літ.: Татарский В. Б. Кристаллооптика и иммерсионный метод исследования минералов. М., 1965.

ІМЖА́, *ападкі атмасферныя* ў выглядзе вельмі дробных кропель дыяметрам не больш за 0,5 *мм*.

Выпадае з слаістых, радзей з слаіста-кучавых воблакаў ці з туману. Пры адмоўных т-рах І. можа выпадаць у пераахалоджаным стане, замярзаючы на зямной паверхні. Пры І. інтэнсіўнасць ападкаў 0,05—0,25 *мм/гадз*. Бачнасць менш 1 км.

ІМІГРА́ЦЫЯ (ад лац. immigrans той, хто ўсяляецца), уезд іншаземцаў у краіну на пастаяннае або часовае пражыванне па палітычных, эканамічных, рэлігійных і інш. прычынах. Дапускаецца толькі з санкцыі адпаведных органаў. Капіталіст. краіны прынялі шэраг законаў, якія абмяжоўваюць уезд і прававое становішча імігрантаў; імігранты церпяць ад нац. і расавай дыскрымінацыі.

ІМІТА́ЦЫЯ (лац. imitatio перайманне), 1) перайманне, падробка. 2) У музыцы — прыём кампазіцыі; паўтарэнне тэмы (або асобнага меладычнага звароту) у якім-н. голасе музычнага твора непасрэдна пасля таго, як яна прагучала ў іншым.

Папярэдні голас, прадаўжаючы свой рух, утварае процістаўленне да І. Побач з дакладнай, ці строгай, І. існуюць больш складаныя ле віды: тональная, аваротная, у павелічэнні, у памяншэнні, ракаходная і інш. Найб. паслядоўна І. праводзіцца ў *каноне*. На ёй заснавана таксама *фуга*. Адзін з асн. сродкаў муз. развіцця ў *поліфаніі*, як эпізадычны прыём шырока ўжываецца і ў музыцы гамафонна-гарманічнага складу. Зарадзілася ў нар. муз. творчасці.

ІМПА́РТ (ад лац. importo прывожу), прывоз тавараў з-за мяжы; процілеглае значэнне — вываз тавараў, *экспарт*. Гл. таксама *Знешні гандаль.*

ІМПЕ́РСКІЯ ГАРАДЫ (ням. Reichsstädte), гарады сярэдневяковай Германіі, падначаленыя непасрэдна імператару.

З 13 ст., з часу заняпаду цэнтральнай карал. улады, мелі шырокія правы самакіравання і паліт. самастойнасці ў межах імперыі. У перыяд напалеонаўскіх войнаў большасць І. г. страціла незалежнасць. Пасля ліквідацыі «Свяшчэннай Рымскай імперыі» (1806) знік і сам статус І. г.

ІМПЕРФЕ́КТ (лац. imperfectus незакончаны), у індаеўрапейскіх мовах простая дзеяслоўная форма прошлага часу, якая абазначала працяглае дзеянне ў мінулым.

У стараслав. і стараж.-рус. мовах І. абазначаў незакончанасць або шматразовасць і ўтвараўся ад асновы інфінітыва з дапамогай суфікса «ѣах-> -аах- (-ях-)>-ах- (-лх-)»: «Несѣахъ> неслахъ> несяхъ» — «я нёс» ці «я насіў». У 12—13 ст. ва ўсх.-слав. мовах перастаў быць жывой формай. Ролю І. выконваюць дзеясловы незакончанага трывання. Астаўся ў сербска-лужыцкай і некат. паўд.-слав. мовах.

ІМПЕ́РЫЯ (ад лац. imperium улада, дзяржава), 1) назва манархічнай дзяржавы на чале з імператарам.

Тытул імператара азначае больш высокі ранг у параўнанні з каралём, царом (спачатку — ганаровы воінскі тытул у рэспубліканскім Рыме, з часоў *Аўгуста* азначаў манарх. ўладу). Пасля падзення рэспублікі І. называўся дзярж. лад Рыма. І. называлася дзяржава Карла Вялікага, Візантыя, «Свяшчэнная Рымская І.», Расія (1721—1917) і інш.

2) Арганізацыя каланіяльнага панавання асобных бурж. дзяржаў, напр. Брытанская І.

ІМПЕРЫЯ́Л (ад лац. imperialis імператарскі), залатая манета Расійскай імперыі. Чаканіўся з 1775, да 1897 змяшчаў 11,61 *г* золата і быў эквівалентны 10 сярэбраным рублям.



Ілюстрацыя І. 1. Іл. да «Апостала» 1564—першай маскоўскай дакладна датаванай друкаванай кнігі. 2. Кемаледзін Бехзад (?). Мініяцюра «Лейлі наведвае Меджнуна» з рукапісу Аміра Хасрова Дэхлеві. Канец 15 — пач. 16. ст. 3. М. Жукоўскі. Іл. да «Шчаслівага нячасця» з кн. «Трагедыі і камедыі...» У. Радзіві. 1754. Нясвіж. 4. Г. Дарэ. Іл. да «Гаргянцюа і Пантагруэля» Ф. Рабле. 1854. 5. А. М. Бенуа. Іл. да «Меднага конніка» А. Пушкіна. 1923. 6. А. А. Агін. Іл. да «Мёртвых душ» М. Гогаля. 1846. 7. П. Пікасо. Іл. да «Лісістраты» Арыстафана. 1934. 8. Р. Кент. Іл. да «Мобі Дзіка» Г. Мелвіла. 1930.











Ілюстрацыя II. 1. Я. Я. Лансерэ. Іл. да «Хаджы Мурата» Л. Талстога. 1913—18. 2. М. В. Дабужынскі. Іл. да «Белых начэй» Ф. Дастаеўскага. 1923. 3. А. Г. Вярэйскі. Іл. да «Ціхага Дона» М. Шолахава. 1952. 4. А. М. Канеўскі. Іл. да кн. «За рубяжом» М. Салтыкова-Шчадрына. 1939. 5. Дз. А. Шмарынаў. Іл. да «Вайны і міру» Л. Талстога. 1953—55. 6. Я. А. Кібрык. Іл. да «Тараса Бульбы» М. Гогаля. 1944—45. 7. У. А. Фаворскі. Іл. да «Прац і дзён Міхаіла Ламаносава». 1932. 8. М. М. Жукаў. Іл. да «Аповесці пра сапраўднага чалавека» Б. Палявога. 1950.











Ілюстрацыя III.
1. А. М. Дзямарын. Іл. да бел. казкі «Ленінская праўда». 1968.
2. А. А. Паслядовіч. Іл. да «Залатой касы» М. Паслядовіча. 1966.
3. А. Г. Лось. Іл. да бел. казкі «Ох і залатая табакерка». 1967.
4. Б. А. Забораў. Іл. да «Раскідача» Р. Барадуліна. 1969.
5. А. М. Кашкурэвіч. Іл. да «Бандароўны» Я. Купалы. 1962.
6. В. А. Тарасаў. Іл. да «Трыбунала» А. Макаёнка. 1970.
7. М. Ц. Гуціеў. Іл. да «Любы Лук'янскай» К. Чорнага. 1961.
8. У. С. і М. С. Басалыгі. Іл. да кн. «Калі ласка» П. Броўкі. Фрагмент. 1971.















1



2



3



4



5



6



7

Ілюстрацыя IV.

1. Л. П. Асецкі. Іл. да «Разгрому» А. Фадзеева. 1965.
2. В. П. Шаранговіч. Іл. да кн. «З майго летапісу» Я. Коласа. 1967.
3. І. А. Давідовіч. Іл. да «Вогненнага азімута» А. Асіпенкі. 1965.
4. У. С. і М. С. Басалыгі. Іл. да «Сцяга брыгады» А. Куляшова. 1970.
5. М. А. Малевіч. Іл. да «Канька-Гарбунка» П. Яршова.
6. Н. М. Паплаўская. Іл. да бел. казкі «Музыка-чарадзей». 1968.
7. Г. Г. Паплаўскі. Іл. да бел. казкі «Дзед і баба». 1967.

Выпускаліся таксама паўімперыялы масаю 5,85 *г*. Пасля грашовай рэформы 1897 І. змяшчаў 7,74 *г* золата і адпавядаў 15 новым залатым рублям. Эмісія І. і паўімперыялаў спынілася ў 1889 (да 1910 зняты з абарачэння), замест іх выпускаліся намінады ½ І. і ⅓ І.

Літ.: Спасский И. Г. Русская монетная система, 4 изд., Л., 1970.

ІМПЕРЫЯЛІЗМ (ад лац. imperium улада, дзяржава), найвышэйшая і апошняя стадыя *капіталізму*, якая пачалася ў канцы 19 — пач. 20 ст. У. І. Ленін даў палітыка-эканам. аналіз сутнасці І., раскрыў 5 яго асн. адзнак: 1) *канцэнтрацыя вытворчасці* і капіталу дайшла да такой высокай ступені, што прывяла да стварэння манаполій, якія адыгрываюць вырашальную ролю ў гаспадарчым жыцці капіталістычных дзяржаў (гл. *Манаполіі*); 2) зліццё банкаўскага капіталу з прамысловым і ўтварэнне на гэтай аснове фін. капіталу, *алігархіі фінансавай*; 3) *вываз капіталу*, які ў адрозненне ад вывазу тавараў набыў асабліва важнае значэнне; 4) утварэнне міжнар. манапал. саюзаў капіталістаў (гл. *Міжнародныя манаполіі*), якія дзеляць свет; 5) завяршэнне тэр. падзелу свету найбуйнейшымі капіталіст. дзяржавамі і барацьба за яго перадзел (гл. *Каланіялізм*).

Пры І. захоўваюцца ўласцівасці капіталізму: прыватная ўласнасць на сродкі вытворчасці, эксплуатацыя наёмных рабочых, пагоня капіталістаў за атрыманнем прыбыткаў. Панаванне манаполій не адмяняе эканам. законаў капіталізму, а абмяжоўвае або ўзмацняе іх дзеянне. Напр., узмацняецца дзеянне *асноўнага эканамічнага закону капіталізму*. І. характэрна атрыманне максімальна магчымага, або манапольна высокага прыбытку, крыніцы якога — бязлітасная эксплуатацыя рабочых, прысваенне праз манапольна высокія цэны часткі прыбавачнай вартасці неманапалізаваных прадпрыемстваў і частка вартасці, створанай дробнымі таваравытворцамі, аграбленнем народа сваёй краіны праз выкананне буйных дзярж. заказаў, якія аплачваюцца са сродкаў падаткаплацельшчыкаў, і народаў інш. краін праз вываз капіталу і розныя формы калан. эксплуатацыі. У выніку манаполіі абмяжоўваюць развіццё прыватнакапіталіст. і дробнатаварнай вытворчасці, узмацняюць абяднение дробных капіталістаў і простых таваравытворцаў. *Картэлі, трасты, сіндыкаты, канцэрны* і інш. віды манаполій процістаяць свабоднай канкурэнцыі, аднак не ліквідуюць яе, бо астаецца яе эканам. аснова — прыватная ўласнасць і таварна-грашовыя адносіны. І.— паразітычны капіталізм, які загнівае. Гэта выяўляецца ў магчымасці манаполій вызначаць манапольна высокія цэны, якія забяспечваюць атрыманне макс. прыбытку, у пастаяннай недагрузцы асн. капіталу, хранічным масавым беспрацоўі, налўнасці і павелічэнні праслойкі асоб, якія жывуць на працэнты ад пазыковага капіталу і даходаў ад каштоўных папер (раншье), у ператварэнні шэрагу дзяржаў, што экспартуюць капітал, у дзяржавы-раншье, у замаруджванні тэхнічнага і інш. прагрэсу. Навук.-тэхн. адкрыцці выкарыстоўваюцца перш-наперш для ўзмацнення мілітарызацыі эканомікі. Толькі за 1970 краіны НАТО выдаткавалі на падрыхтоўку вайны 103 млрд. долараў. У ЗША за 1965—70 на ваенныя мэты пайшло каля 400 млрд. долараў. Паразітызм і загніванне І. выяўляюцца таксама ў рабаванні народаў калан. і залежных краін; у штучным «падкормліванні» рабочай арыстакратыі, каб аслабіць рабочы рух і ўзмацніць яго раскол, падушыць дэмакр. свабоды; у рэакцыі па ўсёй лініі. І.— пярэдняе сацыяліст. рэвалюцыі. Рост канцэнтрацыі ўзмацняе абагульненне вытворчасці і вядзе да рэзкага абвастрэння супярэчнасці паміж грамадскім характарам вытворчасці і прыватнакапіталіст. прысваенем. І. абвастрае ўсе супярэчнасці капіталізму і перш-наперш паміж працай і капіталам, што непазбежна выклікае абвастрэнне барацьбы рабочага класа супраць буржуазіі, падводзіць пралетарыят да сацыяліст. рэвалюцыі як адзінага сродку скончыць з невыносным становішчам. Эксплуатацыя манапал. буржуазіяй сялян, рамеснікаў, інтэлігенцыі, прыгнёт і абядненне дробных неманапалізаваных капіталістаў выклікае глыбокую супярэчнасць паміж манапалістамі, фін. алігархіяй і ўсімі інш. слаямі грамадства. Дзеянне закону нераўнамернасці эканам. і паліт. развіцця капіталізму абумоўлівае супярэчнасць паміж імперыяліст. дзяржавамі. Тыл в іх, што вырваліся наперад, патрабуюць перадзелу на сваю карысць рынкаў збыту, крыніц сыравіны, сфер прыкладання капіталу.

Да пач. 70-х г. 20 ст. вызначыліся асн. цэнтры імперыялістычнага саперніцтва: ЗША — Зах. Еўропа — Японія. Паміж імі ўсё болей абвастраецца эканам. і паліт. канкурэнтная барацьба. Канфлікты паміж імперыялістычнымі краінамі прыводзяць да войнаў, якія аслабляюць усю сістэму капіталізму, паскараюць крызіс пануючага класа, аблягчаюць перамогу рабочага класа. У 1-ю сусв. вайну ланцуг І. прарваўся ў Расіі. У 2-ю сусв. вайну і пасля яе — у краінах Еўропы, Азіі і Лац. Амерыкі. Капіталізм перастаў быць усеабдымнай сістэмай сусв. гаспадаркі. Узнікла, развіваецца і ўмацоўваецца *сусветная сістэма сацыялізма*. Супярэчнасць паміж капіталізмам і сацыялізмам — асн. супярэчнасць сучаснай эпохі. І. выклікаў супярэчнасць паміж імперыялістычнымі дзяржавамі і калоніямі, залежнымі краінамі; яна вылілася ў нац.-вызв. барацьбу прыгнечаных народаў і прывяла да распаду калан. сістэмы і стварэння больш за 70 новых самастойных дзяржаў, якія імперыялісты імкнуцца эксплуатаваць метадамі *неакаланіялізму*. На гэтай аснове ўзмацняюцца супярэчнасці паміж імперыял. дзяржавамі і краінамі, якія сталі на шлях незалежнага развіцця. Барацьба за нац. вызваленне ў многіх краінах стала практычна перарастаць у барацьбу супраць эксплуататарскіх адносін, як феадальных, так і капіталістычных. Імперыялісты атрымліваюць мільярды дол. ад грабяжу народаў краін Азіі, Афрыкі, Лац. Амерыкі, нягледзячы на тое, што на гэтых кантынентах 375 млн. чал. жывуць на мяжы галоднай смерці. Абвастрэнне супярэчнасцей І. паскарае ўтварэнне *дзяржаўна-манапалістычнага капіталізму*. Дзяржаўна-манапал. капіталізм узмацняе нераўнамернасць і скачкападобнасць развіцця капіталізму, розначасовасць выспявання перадумоў сацыяліст. рэвалюцыі ў розных краінах. Рэзкае парушэнне раўнавагі ў сістэме І. стварае магчымасць прарваць яе сацыяліст. рэвалюцыяй у найбольш слабым звяне, якім з'яўляецца краіна (або група краін), дзе ўсе супярэчнасці даведзены да найвышэйшай ступені напружання і ёсць сілы, здольныя вырашыць іх рэвалюц. шляхам (рабочы клас, які прайшоў школу паліт. барацьбы, паяўнасць у яго масавага саюзніка — сялянства і баявой марксісцка-ленінскай партыі, у якой ёсць вопыт рэвалюц. кіраўніцтва). Жыццё поўнасцю пацвердзіла ленінскія вывады пра магчымасць перамогі сацыялізма спачатку ў нямногіх або нават у адной асобна ўзятай краіне, пра тое, што сусв. сацыяліст. рэвалюцыя будзе разгортвацца ападаннем асобных краін ад сістэмы капіталізму. І. выклікаў сац. канфлікты небывалай сілы, якія ўзрушылі да

асноў капіталіст. сістэму гаспадаркі, прывялі да *агульнага крызісу капіталізму*. Пастаяннай з'явай стаў крызіс валютна-фін. сістэмы капіталізму, адначасовы рост інфляцыі і беспрацоўя. У краінах развітага капіталізму каля 8 млн. беспрацоўных. «Сучасны імперыялізм, які імкнецца прыстасавацца да ўмоў барацьбы дзвюх сістэм, да патрабаванняў навуковатэхнічнай рэвалюцыі, валодае некаторымі новымі рысамі. Узмацняецца яго дзяржаўна-манапалістычны характар. Усё шырэй выкарыстоўваюцца такія рычагі, як стымуляванне дзяржавай манапалістычнай канцэнтрацыі вытворчасці і капіталу, пераразмеркаванне ім усё большай долі нацыянальнага даходу, прадастаўленне манаполіям ваенных заказаў, урадавае фінансаванне праграм развіцця прамысловасці і навуковых даследаванняў, складанне праграм эканамічнага развіцця ў маштабе краіны, палітыка імперыялістычнай інтэграцыі, новыя формы вывазу капіталу» (Дакументы міжнароднай Нарады камуністычных і рабочых партый. Масква, 5—17 чэрвеня 1969 года, Мн., 1969, с. 14). Але ўсе захады, якія робіць сучасны І., толькі ўзмацняюць і абвастраюць яго супярэчнасці, падрыхтоўваюць новыя канфлікты ў сусв. сістэме капіталізму.

Літ.: Ленін У. І. Тв. [гл. Даведачны т., ч. 1 (Справочный т. к Полн. собр. соч., ч. 1)]; Матэрыялы XXIV з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Мн., 1971; Документы международной Нарады коммунистических и рабочих партий. Москва, 5—17 июня 1969 года, Мн., 1969; Праграма Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Мн., 1961; Янченко С. Е. Концентрация производства и монополии, Мн., 1960; Экономика Белоруссии в эпоху империализма. 1900—1917, Мн., 1963; Некоторые вопросы экономического развития Белоруссии, Мн., 1969, гл. 1; Политическая экономия современного монополистического капитализма, т. 1—2, М., 1970; Современный империализм и революционная борьба, Прага, 1971. *С. Я. Янчанка.* Мінск.

ІМПЛІКАЦЫЯ (ад лац. implico цесна звязваю), аперацыя матэматычнай логікі, якая ўтварае складанае выказванне з дапамогаю лагічнай звязкі, аналагічнай сэнсу злучніка «калі..., то»: калі A, то B. Сімвалічны запіс: $A \to B$ (чытаецца: калі A, то B; A цягне B; з A вынікае B; A імплікуе B). Імплікатыўнае выказванне складаецца з антэцэдэнта (лац. antecedent папярэдні), перад якім падаецца слова «калі», і кансеквента (лац. consequent вынік, наступны) — выказвання, якое ідзе за словам «то». І. абумоўлівае такую з'яву, як лагічная выснова, пры якой з аднаго выказвання з неабходнасцю вынікае другое. Адрозніваюць пекалькі відаў І.: матэрыяльную, фармальную, строгую, каўзальную і інш. Найбольш шырока ў вылічэннях класічнай логікі выкарыстоўваецца матэрыяльная І. (гл. табл., дзе I азначае ісціннасць A і B, H — іх няісціннасць). Пры вызначэнні матэрыяльнай І. не ўлічваецца сувязь па сэнсе антэцэдэнта і кансеквента, якія разглядаюцца ў сваю чаргу толькі з боку іх прыкметы быць або не быць ісціннымі. $A \to B$ няісцінная І. толькі ў выпадку ісціннасці антэцэдэнта і няісціннасці кансеквента.

A	B	$A \to B$
I	I	I
I	H	H
H	I	I
H	H	I

Літ.: Гл. пры арт. *Матэматычная логіка.* *П. Дз. Пузікаў.* Мінск.

ІМПРЭСІЯНІЗМ (ад франц. impression уражанне), мастацкая плынь, якая абвясціла асн. мэтай мастацтва непасрэднае адлюстраванне з'яў рэчаіснасці так, як яны ўляўляюцца ў імгненных уражаннях, пачуццёвых суб'ектыўных адчуваннях мастака.

І. у вылўл. мастацтве зарадзіўся ў Францыі ў канцы 60-х г. 19 ст. (Э. Манэ, А. Рэнуар, Э. Дэга) пад уплывам рэаліст. мастацтва 40—60-х г. У пару сталасці (70-я г.— 1-я пал. 80-х г.) прадстаўнікамі плыні былі жывапісцы К. Манэ, А. Сіслей, Б. Марызо, К. Пісаро і інш. І. пашырыўся ў іншых краінах. У рус. мастацтве не атрымаў такога развіцця, як на Захадзе. Большасць твораў імпрэсіяністаў прасякнута жыццярадасным светаадчуваннем. Яны сцвярджалі эстэт. вартасць асяроддзя, узнавілі штодзённасць сучаснага горада з яе імклівым рытмам, своеасаблівасць пейзажу і аблічча гараджан, даслягнулі тонкасці ў перадачы эфектаў *пленэра*, зменлівага пераходнага стану прыроды, уздзеяння святла і атмасферы на колер прадметаў. Жывапісная сістэма І. ўласціва разлажэнне складаных тонаў на чыстыя колеры і ўзаемапранікненне раздзельных мазкоў чыстага колеру, светлая і яркая гама фарбаў, багацце валёраў і рэфлексаў. Разам з тым І. адмаўляецца ад вял. грамадскіх праблем, ад прынцыпаў абагульнення і тыпізацыі. З цягам часу ён прыйшоў да неакрэсленых, туманных вобразаў, да страты выразнасці пластычнага аб'ёму і рысунка. Гэта выклікала распад І. як цэласнай сістэмы (сярэдзіна 80-х г.). І., які падпарадкаваў адлюстраванне сучаснасці суб'ектыўным уражанням чалавечага вока, быў сімптомам распаду бурж. мастацтва і даў пачатак фармаліст. кірункам (гл. таксама *Постімпрэсіянізм*).

І. у музыцы ўзнік пад уплывам І. ў жывапісе. Да імпрэсіяністычных рысаў музыкі належыць увага да мімалётных уражанняў, найтанчэйшых псіхал. нюансаў, схільнасць да паэт. пейзажнай праграмнасці, вытанчанай фантастыкі і ўсх. экзотыкі.

Муз. І. ўласцівыя малаўпічасць, рафінаваны гукапіс. Мелодыя адцясняецца на другі план, змыкаецца з гармоніяй, траціць характэрныя класічнай і асабліва рамант. музыцы шырыню і напеўнасць. У складаных акордавых комплексах аслабляюцца ўнутрыладавыя сувязі, адрозненні паміж устойлівымі і няўстойлівымі гукамі. Прымат гарманіі, каларыту, як і сам тып зместу, вядуць да імправізац. цякучасці, рыхласці формы. У той жа час І. істотна ўзбагаціў сродкі гармоніі і аркестроўкі, увёў свежыя, нац.-самабытныя інтанацыі. Склаўся муз. І. у Францыі ў канцы 80-х — пач. 90-х г. 19 ст. Найб. значныя прадстаўнікі К. Дэбюсі і М. Равель, аднак іх творчасць выходзіць за межы муз. І. Імпрэсіяністычныя рысы ёсць у творах П. Дзюка, Л. Абера, Ш. Кеклена, уплыў І. заналі і кампазітары інш. краін (М. дэ Фалья, Ф. Дыліус, Дж. Ф. Маліп'ера, І. Стравінскі ў 10-я г. 20 ст.). У цэлым І. ўласцівыя рысы суб'ектывізму і эстэцтва, адыходу ад рэалізму, што звязана з заняпадам бурж. культуры.

У л-ру І. ўвайшоў у канцы 19 ст. Ім карысталіся многія пісьменнікі (пераважна ў Зах. Еўропе), якія аб'ядноўваліся жаданнем «завастрыць» і павялічыць мастацкую сілу слова. Пачынальнікамі яго лічацца браты Ж. і Э. *Ганкуры*. І. як самастойны метад знік у л-ры ў сярэдзіне 20 ст.

Літ.: Вентури Л. От Мане до Лотрека, пер. с итальян., М., 1958; Ревалд Д. История импрессионизма, пер. с англ., Л.— М., 1959; Импрессионизм, пер. с франц., Л., 1969; Чегодаев А. Д. Импрессионизм, М., 1971; Kroher E. Impressionismus in der Musik, Leipzig, [1957].

Да арт. Імпрэсіянізм. К. Манэ. Бульвар капуцынак у Парыжы. 1873. Музей выяўленчых мастацтваў імя Пушкіна. Масква.



ІМПУЛЬС (колькасць руху), мера механічнага руху $\vec{p}$, роўная для матэрыяльнага пункта здабытку масы m гэтага пункта на яго скорасць $\vec{v}$. Вектарная велічыня накіраваная адполькава з вектарам скорасці.

І. сістэмы матэрыяльных пунктаў $\vec{P}$ роўны геам. суме І. усіх пунктаў: $\vec{P} = \Sigma \vec{p}_k = \Sigma m_k \vec{v}_k$. Змена І. сістэмы магчыма толькі пад дзеяннем знешніх сіл і вызначаецца ўраўненнем: $\frac{d\vec{P}}{dt} = \Sigma \vec{F}_k$. Пры адсутнасці знешніх дзеянняў І. сістэмы астаецца пастаянным (гл. *Захавання законы*). І. — адна з найб. фундаментальных велічынь, якія характарызуюць фіз. сістэмы (у тым ліку эл.-магн., гравітацыйныя і інш. палі).

ІМПУЛЬС НЕРВОВЫ, біяпатэнцыял дзеяння, у аснове якога ляжыць складаная сістэма фізіка-хімічных працэсаў.

Узнікае ад раздражнення рэцэптараў, нервавога валакна або цела нервовай клеткі. Распаўсюджваецца са скорасцю да 120 *м/сек*. Суправаджаецца зменай узбуджальнасці, электраправоднасці, вязкасці пратаплазмы, пранікальнасці мембраны. З'яўляецца фізічным пераносчыкам інфармацыі па нервовых валокнах. Дзякуючы І. н. праз нерв. сістэму забяспечваецца рэгуляцыя функцый органаў чалавека і жывёлы. Гл. таксама *Біяэлектрычныя патэнцыялы, Узбуджэнне*.

Літ.: Біофизика, М., 1968; Общая и частная физиология нервной системы, Л., 1969; Коган А. Б. Электрофизиология, М., 1969 (бібліягр.); Ходжкин А. Нервный импульс, пер. с англ., М., 1965 (бібліягр.). *М. С. Бань.* Мінск.

ІМПУЛЬС СІЛЫ, вектарная велічыня, роўная здабытку сілы $\vec{F}$ на час яе дзеяння Δt. Асн. характарыстыка *ўдару*. І. с. роўны змене колькасці руху (гл. *Імпульс*): $\vec{F} \cdot \Delta t = \Delta(m\vec{v})$.

ІМПУЛЬС ЭЛЕКТРЫЧНЫ, кароткачасовы скачок току ці напружання ў электрычным ланцугу. Адрозніваюць відэаімпульсы (імпульсы пастаяннага току) і радыёімпульсы (пакеты імпульсаў высокачастотных ваганняў).



Асн. характарыстыкі І. э.— амплітуда, працягласць, частата праходжання, форма і інш. Па форме бываюць (гл. рыс.): прамавугольныя (*а*), трохвугольныя, трапецаідальныя, каўпакападобныя (*б*), экспаненцыяльныя і інш. Шырока выкарыстоўваюцца ў радыётэхніцы, імпульснай тэхніцы, аўтаматыцы, тэлебачанні, тэлеграфіі, радыёлакацыі, радыёсувязі і інш.

ІМПУЛЬСНАЯ ТЭХНІКА, галіна тэхнікі генеравання, пераўтварэння, узмацнення электрычных імпульсаў.

Апаратуры І. т. характэрны імпульсны рэжым работы, г. зн. кароткачасовае з'яўленне і знікненне сігналаў (напр., кароткачасовае з'яўленне эл. напружання ці току). У І. т. выкарыстоўваюць розныя імпульсы, якія характарызуюцца амплітудай, працягласцю, частатой праходжання, шчылінністю і формаю. Найчасцей ужываюцца імпульсы прамавугольнай формы, выкарыстоўваюцца таксама імпульсы трохвугольнай, трапецаідальнай, каўпакападобнай і экспаненцыяльнай формаў. Перадача інфармацыі ў І. т. адбываецца пры ўздзеянні (мадуляцыі) на тую ці іншую характарыстыку імпульсаў (амплітуду, працягласць і г. д.). У залежнасці ад віду ўздзеяння адрозніваюць амплітудна-імпульсную, шыротна-імпульсную, фазава-імпульсную, частотна-імпульсную і кода-імпульсную мадуляцыі. Асн. элементамі імпульсных прылад з'яўляюцца трыгеры, мультывібратары, блокінг-генератары, генератары пілападобнага напружання, абмежавальнікі, селектары імпульсаў, імпульсныя трансфарматары, лініі затрымкі. Гэтыя элементы будуюцца з выкарыстаннем імпульсных лямпавых і паўправадніковых прылад. Імпульсныя прылады выкарыстоўваюцца ў радыётэхніцы, радыёлакацыі, тэлеграфнай сувязі, тэлебачанні, радыёнавігацыі, радыётэлемеханіцы, радыёастраноміі, вылічальнай тэхніцы, у сістэмах аўтам. рэгулявання, пры навук. даследаваннях у атамнай фізіцы (падлік элементарных часцінак і інш.), у медыцыне і г. д.

Літ.: Кривицкий Б. Х. Элементы и устройства импульсной техники, 2 изд., М., 1961; Гольденберг Л. М. Основы импульсной техники, 2 изд., М., 1964. *Б. І. Фірага.* Мінск.

ІМУНАЛО́ГІЯ (лац. immunitas вызваленне+...*логія*), навука пра *імунітэт*. Да І. адносяць таксама алергалогію, навуку пра *алергію*. Вывучае антыгены, антыцелы і хваробы, абумоўленыя імуналагічнымі рэакцыямі. Падзяляецца на інфекцыйную і неінфекцыйную. Уключае імунахімію, імунамарфалогію, імунагенетыку, трансплантацыйную І., І. антагенезу, імунапаталогію, імунагематалогію і прыватна інфекцыйную І.

Пачатак І. як навукі — стварэнне метаду прафілактыкі воспы англ. урачом Э. Джэнерам (1798), абгрунтаванне прынцыпаў вакцынацыі супраць шэрагу інфекцый франц. вучоным Л. Пастэрам (1881) і адкрыццё фагацітозу рус. мікрабіёлагам І. І. Мечнікавым (1887). Вынік выкарыстання дадзеных І. на практыцы — стварэнне шэрагу эфектыўных сродкаў для дыягностыкі, прафілактыкі і лячэння інфекц. і алергічных хвароб, паспяховае пераадольванне бар'еру несумяшчальнасці тканак пры іх перасадцы (гл. *Трансплантацыя*), выяўленне ролі імуналагічных механізмаў у працэсах індывідуальнага развіцця і ў падтрыманні генетычнага пастаянства ўнутранага асяроддзя арганізма. Бел. вучоныя В. І. Вацлаў, Э. У. Фельдман, В. А. Сайкоўская, В. К. Белавусава, Л. І. Бардзіна, В. П. Пашук, У. М. Карзенка (Бел. НДІ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі) удасканалілі поліямізітную і воспавую вакцыны, распрацавалі прэпараты па дыягностыцы гельмінтозаў і спосаб атрымання антыцелаў, далі імуналагічную характарыстыку кліншчовага энцэфаліту і бруцэлёзу ў БССР. Б. Я. Эльбертам (разам з М. А. Гайскім) створана процітуляремійная вакцына. Эльберт, А. П. Красільнікаў і Н. А. Ізраіцель (Мінскі мед. ін-т) вывучылі антыгенныя асаблівасці ўзбуджальніка і імунітэт пры склероме. Г. В. Краскоўскі (Ін-т генетыкі і цыталогіі АН БССР) высветліў шэраг тэарэтычных пытанняў ракавай анергіі. Па пытаннях І. выдаюцца час.: «Журнал микробиологии, эпидемиологии и иммунобиологии» (СССР), «Journal of Immunology» («Часопіс імуналогіі», ЗША), «Immunology» («Імуналогія». Вялікабрытанія), «Revue d'Immunologie et de Therapie Antimicrobienne» («Часопіс

імуналогіі і антымікробнай тэрапіі», Францыя), «Ceskoslovenská Epidemiologie, Mikrobiologie, Imunologie» («Чэхаславацкая эпідэміялогія, мікрабіялогія, імуналогія», ЧССР) і інш.

Літ.: Иммунологические исследования в диагностике и профилактике инфекционных заболеваний, Мн., 1968; Красковский Г. В. Иммуногенетические основы раковой анергии, Мн., 1970; Острый энцефаломиелит в эксперименте и клинике, Мн., 1969; Петров Р. В. Иммунология вчера и сегодня, «Журнал Всесоюзного химического об-ва им. Менделеева», 1968, т. 13, № 4; Ярго ж. Введение в неинфекционную иммунологию, Новосибирск, 1968; Бойд У. Основы иммунологии, пер. с англ., М., 1969.

А. В. Давыдаў. Мінск.

ІМУНІТЭТ (лац. immunitas вызваленне), неўспрымальнасць арганізма да інфекцыйных, інвазійных хвароб і іншародных рэчываў (бялкі, бялкова-ліпідныя комплексы, нуклеінавыя кіслоты, поліцукрыды).

І. вядомы са старажытнасці. У 1798 англ. ўрач Э. Джэнер даказаў магчымасць прышчэпак супраць воспы для выпрацоўкі І. Уласцівасць клетак крыві і розных тканак арганізма паглынаць мікробы і іншародныя целы адкрыў рус. мікрабіёлаг І. І. Мечнікаў (гл. *Фагацытоз*). Гумаральныя фактары І. (бактэрыцыдныя ўласцівасці сывараткі крыві) адкрылі нямецкія эпідэміёлагі Э. Берынг, Г. Бухнер, П. Эрліх і франц. эпідэміёлаг Э. Ру. Адрозніваюць прыроджаны і набыты І. Прыроджаны — відавая ўласцівасць, якая перадаецца па спадчыне. Набыты — індывідуальная ўласцівасць, узнікае пасля інфекц. хвароб, вакцынацыі (актыўны І.), пасля ўвядзення імунных сываратак (пасіўны І.). Прыроджаны І. забяспечваецца ахоўнымі клетачнымі і гумаральнымі фактарамі крыві, скуры, слізістых абалонак, страўнікавага соку, мачы; рэакцыямі спалучанага і складанага ўзаемадзеяння гэтых фактараў (фагацытоз, запаленне), дзеяннем бактэрыцыдных і віруліцыдных фактараў (лізацым, прапердзін, інтэрферон, глабуліны крыві і слізістых абалонак), а таксама антымікробнымі ферментамі. Набыты І. характарызуецца інтэграваннем фактараў прыроджанага і набыццём дадатковых ахоўных фактараў (антыцелаў — імунных глабулінаў, антывірусных клетачных злучэнняў). Уласцівасці І. выкарыстоўваюць для дыягностыкі (сералагічныя і *алергічныя метады дыягностыкі*), прафілактыкі (гл. *Вакцыны, Гама-глабулін*) і лячэння інфекц. і інвазійных хвароб. Вывучае І. навука *імуналогія*.

Літ.: Мечников И. И. Невосприимчивость в инфекционных болезнях, 2 изд., М., 1947; Здродовский П. Ф. Проблемы инфекции, иммунитета и аллергии, 3 изд., М., 1969; Зибицкер Д. Е. и Ковалев Н. А. Бешенство и его профилактика, Мн., 1968; Бернет Ф. Целостность организма и иммунитет, пер. с англ., М., 1964 (бібліягр.); гл. таксама пры арт. *Вакцыны*.

В. І. Вацлаў. Мінск.

ІМУНІТЭТ (у праве), асобныя правы і прывілеі, якія даюцца дэпутатам або дыпламатычным прадстаўнікам.

Дыпламатычны І.— сукупнасць асабістых правоў, якімі карыстаюцца замежныя дыпламат. прадстаўнікі на тэр. дзяржавы, дзе яны акрэдытаваны: недатыкальнасць асобы, службовых і асабістых памяшканняў; непадсуднасць мясцоваму суду; права свабодных зносін са сваёю дзяржавай. Пашыраецца на жонку (мужа) і непаўналетніх дзяцей дыпламата. У міжнар. праве адрозніваюць І. дзяржавы ад замежнай юрысдыкцыі (непадсуднасць дзяржавы суду інш. дзяржавы). У СССР дэпутаты Вярх. Савета СССР, саюзных і аўт. рэспублік, а таксама мясцовых Саветаў не могуць быць арыштаваны ці прыцягнуты да крымін. адказнасці без згоды адпаведнага Савета ці выканаўчага органа Савета. У перыяд феадалізму І. карысталіся саноўнікі царквы, феадалы, купцы і інш.

Літ.: Зорин В. А. Основы дипломатической службы, М., 1964; Кудинов Н. А. Советский депутат, Мн., 1962.

Л. В. Пайлава. Мінск.

ІМХІ, клас археганіяльных раслін. Гл. ў арт. *Мохападобныя*.

ІМШАНЕЦКІ Аляксандр Аляксандравіч [н. 26.12.1904 (8.1.1905), Кіеў], савецкі вучоны ў галіне мікрабіялогіі. Акад. АН СССР (1962, чл.-кар. 1946). Скончыў Варонежскі ун-т (1926). З 1949 дырэктар Ін-та мікрабіялогіі АН СССР. Асн. працы па будову, фізіялогію, сістэматыку, экалогію мікраарганізмаў, іх ролю ў кругавароце рэчываў у прыродзе, раскладанне цэлюлозы мікраарганізмамі, зменлівасць мікробаў пад уплывам мутагенаў, па метады прамога адбору мікробаў і некат. пытанні касм. біялогіі. Даследаванні І. маюць практычнае значэнне ў вытворчасці ферментаў, антыбіётыкаў, спірту і інш. Заснавальнік і першы прэзідэнт (1960—64) Усесаюзнага мікрабіял. т-ва. Гал. рэдактар (з 1949) час. «Микробиология» і «Успехи микробиологии». Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі.



Тв.: Строение бактерий, М.— Л., 1940; Микробиологические процессы при высоких температурах, М.— Л., 1944; Микробиология целлюлозы, М., 1953; Экспериментальная изменчивость микроорганизмов, М., 1956.

Літ.: Александр Александрович Имшенецкий, М., 1967 (Материалы к биобиблиогр. ученых СССР).

ІМШАНКІ (Bryozoa, Polyzoa), тып беспазваночных жывёл. Пашыраны ва ўсіх морах і ў прэсных водах. Усяго каля 20 тыс. відаў, у т. л. сучасных каля 4 тыс. У СССР каля 450 відаў у морах і 15 відаў у прэсных вадаёмах.

І.— водныя, сядзячыя, каланіяльныя формы. Памеры не больш за 1 *мм*. Жывуць паліморфныя калоніямі, у якіх асобіны выконваюць розныя функцыі. Характэрная рыса І.— лафафар (своеасаблівы орган, з доўгімі шчупальцамі, укрытымі расінчкамі, якія ствараюць цёк вады да ротавай адтуліны). Дзякуючы вапнаваму шкілету І. добра зберагліся ў выкапнёвым стане, вядомы з ардовіку. На Беларусі рэшткі І. знойдзены ў адкладах ардовіка, сілурыйскай, дэвонскай, каменнавугальнай, пермскай і мелавой сістэм. Маюць значэнне як формы, паводле якіх вызначаюць узрост пластоў.

Літ.: Основы палеонтологии. Мшанки, брахиоподы, М., 1960; Астрова Г. Г. Морфология, история развития и система ордовикских и силурийских мшанок, М., 1965; Жизнь животных, т. 1, М., 1968.

В. І. Пушкін. Мінск.

ІМШАРА, вярховае (сфагнавае) *балота*, парослае хвояй, радзей бярозаю. Тэрмін, які ўжываецца на Беларусі, Украіне, у цэнтральных і паўночных раёнах Еўрап. ч. СССР. Выкарыстоўваецца ў навук. лесатапалагічнай л-ры.

ІМШАРНІЦА, род вечназялёных раслін; тое, што *андрамеда*.

ІМЯ (у логіцы), выраз мовы, які ў самым шырокім сэнсе абазначае пэўны прадмет. Сучасная логіка разумее пад І. не толькі тэрміны, але і інш. асэнсаваныя моўныя выразы (гл. *Значэнне і сэнс*). Пад адносінамі называння ў такім выпадку разумеюць адносіны паміж выразам мовы і канкрэтным або абстрактным аб'ектам, імем якога выраз з'яўляецца.

ІМЯНІН, вёска ў Драгічынскім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Радзіма». За 25 *км* на ПнЗ ад Драгічына, 94 *км* ад Брэста, 15 *км* ад чыг. ст. Антопаль. 1009 ж., гасп. 305 (1971). Швейная і шавецкая майстэрні. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, фельчарска-акушэрскі пункт, ветэрынарны пункт, аддзяленне сувязі, магазін. Помнік 241 савецкаму воіну і партызану, якія загінулі ў Айчынную вайну.

ІМЯНІНЫ, вёска ў Яроміцкім с/с Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр саўгаса імя Жданава. За 3 *км* на Пн ад Кобрына, 55 *км* ад Брэста. 515 ж., гасп. 199 (1971). Васьмігадовая школа, вет. ўчастак, аддз. сувязі, 2 магазіны.

ІНАВА, возера ў бас. р. Вяты, левага прытока Зах. Дзвіны, у Браслаўскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 1,3 *км*². Даўж. 2,7 *км*, найб. шыр. 0,9 *км*, сярэдняя 0,5 *км*, найб. глыб. 9 *м*, сярэдняя 5 *м*. Катлавіна выцягнута з З на У, схілы пераважна пад ворывам. Вадазбор (13,9 *км*²) узгорысты. Сцёк з І. ў воз. Укля. Водзяцца плотка, верхаводка, судак, шчупак, лінь, карась.

ІНАЗЕ́МЦАЎ Георгій Аляксандравіч [17 (30). 4.1902, с. Батайск Вобл. Войска Данскога — 15.2.1957], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1944. На фронце з 1942. Вызначыўся ў Віцебскай вобл. 23.6.1944 полк пад камандаваннем І. прарваў абарону праціўніка, перарэзаў чыг. Віцебск — Полацк, фарсіраваў Зах. Дзвіну і замацаваўся на левым беразе.

ІНАЗЕ́МЦАЎ Мікалай Мікалаевіч (н. 4.4. 1921, Масква), савецкі гісторык і эканаміст-міжнароднік. Акад. АН СССР (1968, чл.-кар. 1964). Чл. КПСС з 1943. Удзельнік Айч. вайны. Скончыў Маскоўскі дзярж. ін-т міжнар. адносін (1949). У 1957—61 заг. сектара міжнар. адносін, нам. дырэктара Ін-та сусв. эканомікі і міжнар. адносін АН СССР. З 1961 нам. гал. рэдактара газ. «Правда», з 1966 дырэктар Ін-та сусв. эканомікі і міжнар. адносін АН СССР. Аўтар прац па праблемах знешняй палітыкі, міжнар. адносін, сусв. эканомікі. На XXIV з'ездзе КПСС выбраны канд. у чл. ЦК. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 5 інш. ордэнамі, медалямі.



Тв.: Американский империализм и германский вопрос (1945—1954), М., 1954; Внешняя политика США в эпоху империализма, М., 1960; Проблемы экономики и политики современного империализма, М., 1969.

ІНАСАРЫДЗЕ Георгій Майсеевіч (н. 25.12. 1920, с. Вахані Тыфліскага пав.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1944. На фронце з 1941, лётчык-штурмавік. 29.12.1943 у складаных умовах вядучы 6 самалётаў даставіў боепрыпасы партызанам, якія вялі бой у варожым акружэнні каля в. Улы Віцебскай вобл. У час Беларускай аперацыі 1944 кантралявaў чыгунку Віцебск — Орша, наносіў бомбавыя ўдары па эшалонах праціўніка. Зрабіў 188 баявых вылетаў, знішчыў 15 варожых цягнікоў, 34 артбатарэі, 30 танкаў, 108 аўтамашын, 10 бронетранспарцёраў. Жыве ў Тбілісі.

ІНБЕЛКУЛЬТ, гл. *Інстытут беларускай культуры*.

ІНБЕР Вера Міхайлаўна [н. 28.6 (10.7).1890, Адэса], руская савецкая пісьменніца. Чл. КПСС з 1943. Друкуецца з 1910. Першыя зб. вершаў «Маркотнае віно» (1914), «Горкая ўцеха» (1917) і інш. З пач. 20-х г., калі І. усвядоміла сябе пісьменніцай сав. эпохі, пачынаецца новы этап яе творчай біяграфіі. У аповесці «Месца пад сонцам» (1928) адлюстраваны шлях інтэлігента да новага жыцця ў паслярэвалюц. Расіі. У Айч. вайну І. у Ленінградзе. У зб. вершаў «Душа Ленінграда» (1942), у паэме «Пулкаўскі мерыдыян» (1941—43, Дзярж. прэмія СССР 1946), ленінградскім дзённіку «Амаль тры гады» (1946, Дзярж. прэмія СССР 1946) паказала гераізм ленінградцаў. Аўтар паэмы «Дамоў, дамоў!» (1946), цыкла вершаў «Шлях вады» (1951), кн. вершаў пра У. І. Леніна «Красавік» (1960), кн. успамінаў і літаратурна-крытычных артыкулаў «За многія гады» (1964), «Калі старонкі дзён перабіраеш» (1967). Узнагароджана 4 ордэнамі, медалямі.

Тв.: Собр. соч., т. 1—4, М., 1965—66; Избр. проза, М., 1952; Анкета времени, М., 1971; бел. пер. у кн.— Анталогія рускай савецкай паэзіі, Мн., 1936; Руская савецкая паэзія. Мн., 1953.

Літ.: Гринберг И. Л. Вера Инбер, М., 1961.

А. Р. Жакай. Мінск.

ІНБРЫДЗІНГ (англ. inbreeding ад in у+ +breed спарваць), блізкароднаснае скрыжаванне, скрыжаванне блізкіх паводле паходжання арганізмаў (самаапыленне ў перакрыжавана-апыляльных раслін, скрыжаванне паміж роднаснымі жывёламі). Як правіла, І. зніжае жыццяздольнасць і прадукцыйнасць патомства.

Адна з асн. прычын дэпрэсіі — пераход у гомазіготны стан (гл. *Гомазіготнасць*) і праяўленне ў фенатыпе рэцэсіўных генаў, якія зніжаюць жыццяздольнасць. У выніку І. аднародны па сваіх прыкметах сорт раслін ці парода жывёл распадаецца на шэраг ліній з рознымі прыкметамі, г. зн. адбываецца дыферэнцыяцыя генатыпу. Пры скрыжаванні арганізмаў, атрыманых праз І., бывае гетэрозісны эфект (гл. *Гетэрозіс*). Таму І. выкарыстоўваецца ў селекцыі. Процілегласць І.— *аўтбрыдзінг*.

Літ.: Лобашев М. Е. Генетика, 2 изд., Л., 1969.

М. А. Картэль. Мінск.

ІНВАЗІЯ (лац. invasio нападзенне), заражэнне чалавека, жывёл і раслін паразітамі жывёльнага паходжання. Паразіты могуць пранікаць праз скурнае покрыва (актыўная І.), праз плацэнту (унутрычэраўная І.), заносіцца з ядой, вадой (пасіўная І.).

Інвазійныя хваробы падзяляюць на протазаанозы (узбуджальнікі прасцейшыя) — *малярыя, піраплазмозы*, трыпаназамозы, какцыдыёзы; *гельмінтозы*; акарыдозы (узбуджальнікі кляшчы і інш. павукападобныя) — *кароста*; энтамозы (узбуджальнікі насякомыя) — *аваднёвыя хваробы*; карцынозы (узбуджальнікі ракападобныя) — хваробы скуры і жабраў у рыб. Вывучае інвазійныя хваробы і распрацоўвае мерапрыемствы для барацьбы з імі *паразіталогія*.

Літ.: Павловский Е. Н. Руководство по паразитологии человека..., т. 1—2, 5 изд., М.— Л., 1946—48; гл. таксама літ. пры арт. *Гельмінталогія, Гельмінтозы, Паразіталогія*.

ІНВАЛІ́ДНАСЦЬ (лац. invalidus слабы, нядужы), фізічны і псіхічны стан чалавека, які характарызуецца пастаяннай або доўгай, поўнай або частковай стратай працаздольнасці ад хвароб, знявечання ці дэфектаў развіцця. І.— паняцце біял., сац. і прававое. Як біял. паняцце І. вызначаецца характарам хваробы або ступенню анат. і функцыянальных парушэнняў; як сац.— спыненнем або перамена прафес. працы; як прававое — умовамі і абставінамі, пры якіх узнікла І., правам на пенсію, на працаўладкаванне і інш. віды *сацыяльнага забеспячэння*. І.— адна з гал. прыкмет сан. стану насельніцтва.

Урачэбна-экспертныя камісіі (УТЭК) адрозніваюць 3 групы І. Да 1-й належаць асобы з поўнай (пастаяннай або доўгай) стратай працаздольнасці, якім патрэбна пастаянная пабочная дапамога. Да 2-й — асобы, што страцілі поўнасцю працаздольнасць, але ім не патрэбна пастаянная пабочная дапамога (камбінаваныя дэфекты апорна-рухальнага апарата і значная страта зроку). Яны працуюць у спец. умовах (у каапэрацыі інваліда, дома). Да 3-й групы належаць асобы, якім неабходна змяніць прафесію або палегчыць умовы працы. І. класіфікуюць паводле прычын, што выклікалі яе: І. ад агульных і прафес. хвароб; ад працоўнага знявечання; з дзяцінства; І., звязаная з вайсковай службай. Сярод прычын першаснай І. у БССР найб. удзельную вагу маюць хваробы органаў кровазвароту, нервовай сістэмы, органаў адчування і злаякасныя пухліны. Велічыня і характар сац. забеспячэння залежаць ад групы і прычыны І. Біял. (клінічныя, фізіял.) і сац. фактары, якія вызначаюць працаздольнасць інваліда, пад уплывам лячэння і рацыянальнага працаўладкавання змяняюцца. У БССР зніжаецца паказчык першаснай І. ад туберкулёзу і хвароб сардэчна-сасудзістай сістэмы. Для праверкі стану працаздольнасці інваліду робяць паўторны ўрачэбны агляд: інваліду 1-й групы праз 2 гады, 2-й і 3-й — праз год. Калі І. абумоўлена анат. дэфектамі або невылечнымі хранічнымі хваробамі, група І. назначаецца бестэрмінова. Пажыццёва назначаюцца 1-я і 2-я групы інвалідам Вял. Айч. вайны. Перавод на І. не дае развівацца цяжкім формам хваробы; працатэрапія стымулюе ўзнаўленне працаздольнасці.

Літ.: Арбатская Ю. Д. Врачебно-трудовая экспертиза, М., 1967; Врачебно-трудовая экспертиза, реабилитация трудоспособности, профилактика инвалидности, Мн., 1969. *Дз. П. Бяляцкі.* Мінск.

ІНВАРЫЯ́НТ (ад лац. in не+varians зменны), лік, алгебраічны выраз або некаторае інш. матэм. паняцце, якое звязана з пэўным матэм. аб'ектам і астаецца нязменным для вызначаных класаў яго пераўтварэнняў.

Месцазнаходжанне адрэзка M_1M_2 на плоскасці ў прамавугольнай сістэме каардынат вызначаецца дзвюма парамі лікаў x_1, y_1 (M_1) і x_2, y_2 (M_2). Пасля пераўтварэння каардынатнай сістэмы (паралельны перанос ці паварот восі) пункты M_1 і M_2 будуць мець іншыя каардынаты $[x'_1, y'_1$ і $x'_2, y'_2]$, але $(x_1-x_2)^2+(y_1-y_2)^2=(x'_1-x'_2)^2+(y'_1-y'_2)^2$, таму выраз $(x_1-x_2)^2+(y_1-y_2)^2$ ёсць І. указаных пераўтварэнняў прамавугольных каардынат. Геам. сэнс гэтага І.— квадрат даўжыні адрэзка M_1M_2. Паняцце І. дае магчымасць вылучыць велічыні, незалежныя ад выбару сістэмы каардынат, г. зн. велічыні, якія характарызуюць унутраныя ўласцівасці аб'екта, што даследуецца. Задачы вывучэння І. узнікаюць пры вывучэнні крывых і паверхняў вышэйшых парадкаў, у *праектыўнай геаметрыі*, у *тапалогіі* і інш.

ІНВЕНТА́РНЫЯ ПРАВІ́ЛЫ (**інвента́рныя пала́жэнні**), мерапрыемствы царскага ўрада па рэгуляванні ўзаемаадносін паміж памешчыкамі і іх прыгоннымі на Беларусі, у Літве і Правабярэжнай Украіне. Уведзены на падставе закону ад 15.4.1844, дзейнічалі фармальна да 19.2.1861, фактычна пазней. Праз 6 гадоў І. п. мяркаваліся замяніць новымі. 22.12.1852 зацверджаны новыя І. п., якія з-за пратэсту памешчыкаў не былі ўведзены. Абумоўлены шэрагам прычын, з якіх найгалоўнейшыя — рост галечы сялян ва ўмовах распаду феад.-прыгонніай сістэмы і ўзмацненне сялянскага руху. Мелі на мэце змякчэнне класавых супярэчнасцей у вёсцы. Пашыраны найперш на губерні, дзе пераважала польскае землеўладанне і памешчыкі варожа ставіліся да царызму. Намаганні царскага ўрада ўціхамірыць прыгонную вёску з дапамогай І. п. не далі пажаданых вынікаў, класавая барацьба абвастрылася і паскорыла адмену прыгону.

Сутнасць І. п. зводзілася да наступнага: ільготы памешчыкаў, іх правы на сялян і зямлю прызнаваліся непарушнымі. Усе сяляне падзяліліся на 3 групы: 1) ворных, ці цяглых; 2) агародніка ў, ці халупнікаў; 3) бабылёў, ці кутнікаў. 1-й групе памешчыкі мусілі выдзяляць надзел, «дастатковы» для ўтрымання працаздольных членаў сям'і, а ў малазямельных маёнтках сялянам адводзілася не болей $^2/_3$ усёй зямлі ўласніка. 2-я група магла атрымаць толькі сядзібу, 3-я зямлі не атрымлівала. Ажыццяўленне рэформы ўскладалася на спец. інвентарныя к-ты пад афіц. назвай «К-ты для разгляду і складання інвентароў памешчыцкім маёнткам у заходніх губернях» на чале з цывільным губернатарам; у іх склад уваходзілі віцэ-губернатар, губернскі і павятовы прадвадзіцелі дваранства, чыноўнік ад ген.-губернатара і 3 мясцовыя памешчыкі. Камітэты мусілі патрабаваць ад памешчыкаў падачы інвентароў, наглядалі за іх афармленнем і зацвярджалі, калі яны не пярэчылі І. п. Інвентары звычайна мелі звесткі пра колькасць сялянскіх двароў, прыгонных, наяўнасць у сяле жывёлы і птушак. У звестках пра маёнткі ў інвентары ў асноўным уключаліся дадзеныя пра фальваркавую ворную зямлю і пашу. І. п. 1844 павінны былі ўводзіцца на агульных асновах ва ўсіх 9 зах. губернях, але мелі месца значныя адхіленні.

У Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай і Мінскай губ. (Віленскае генерал-губернатарства) інвентарныя к-ты ўтвораны ў маі — чэрв. 1844. Мінскі к-т работу па складанні і разглядзе інвентароў скончыў да 27.7.1846, віленскі і ковенскі да 1.2.1847, гродзенскі пазней. Увядзенне І. п. завершана ў гэтых губернях у 1848. Павіннасці сялян вызначаліся паводле спец. правілаў, зацверджаных ген.-губернатарам. Іх памер залежаў ад велічыні і якасці ўчастка зямлі. Звычаёвай павіннасцю лічылася $^1/_3$ валавога даходу, які спаганяўся ў выглядзе паншчыны і данінаў. За карыстанне лесам, пашай, вадаёмамі і інш. вызначаліся дадатковыя павіннасці. Агародніку, апроч $^1/_3$ валавога даходу з участка, якім карысталіся, адпрацоўвалі яшчэ 1 дзень паншчыны ў тыдзень, бабылі (кутнікі) плацілі аброк (8% ад платы, якую атрымоўвалі) або па жаданні памешчыка адбывалі 24 дні паншчыны за год.

У Віцебскай і Магілёўскай губ. складанне і разгляд інвентароў праходзілі марудна, бо памешчыкі патрабавалі ў якасці павіннасці сялян не $^1/_3$ іх валавога даходу, а трохдзённай паншчыны з рабочай душы ў тыдзень. Пад 1849 інвентары былі складзены, але не ўведзены з прычыны іх недакладнасці. У 1852 у гэтых губернях уведзены І. п. на аснове правілаў Кіеўскага ген.-губернатарства, паводле якіх сялянам пакідалася зямля, што была ў іх карыстанні. Па хадайніцтве памешчыкаў увядзенне гэтых правілаў было спынена і 14.3.1855 Дзярж. саветам зацверджаны новыя. Памешчыкі мусілі выдзяліць на кожную рэвізскую душу не меней за 4,75 дзесяціны прыгоднай зямлі. Калі надзел перавышаў 9 дзесяцін, памешчык меў права яго паменшыць; дазвалялася замена сялянскіх зямель. Паншчына вызначалася ў 3 мужчынскія і 3 жаночыя дні на тыдзень. Але і гэтыя І. п. ў сувязі з распачатай падрыхтоўкай да рэформы 1861 былі ўведзены ў нязначнай частцы маёнткаў.

У Кіеўскай, Падольскай і Валынскай губ. (Правабярэжная Украіна) складанне інвентароў было скончана ў 1846. 26.5.1847 прынята новая рэдакцыя, заменена 29.12.1848. Уся зямля, якая была ў карыстанні сялян, аставалася за імі. Цяглыя сяляне адбывалі паншчыну: 3 вупражныя і 1 жаночы дзень на тыдзень, пешыя — па 2 дні мужчынскія і 1 жаночы.

Літ.: Улащик Н. Н. Введение обязательных инвентарей в Белоруссии и Литве, у кн.: Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы. 1958 г., Таллин, 1959; Ягодж. Инвентари помещичьих имений Западной Белоруссии и Литвы 40-х годов XIX века как исторический источник, у кн.: Проблемы источниковедения, в. 10, М., 1962; Кошик А. К. Инвентарная реформа 1847—1848 гг. и крестьянское движение на Правобережной Украине, «Науч. зап. Київ. ун-ту», 1949, т. 8, в. 1. Історичний зб., № 2. *Э. М. Савіцкі.* Мінск.

ІНВЕНТА́РЫ (ад лац. inventarium вопіс), вопісы ўладанняў феадалаў у 16—18 ст. Складаліся ў Вял. кн. Літ., Польшчы, Венгрыі. Вядомы поўныя і кароткія І.

Поўныя І. складаюцца з 3 частак. 1-я змяшчае звесткі пра жыллёвыя і гасп. пабудовы феад. двара, іх архітэктуру і планіроўку, маёмасць, гаспадарку (памеры пашы, пасеваў па культурах, пералік жывёлы, апісанне млыноў, вінакурняў і інш. прадпрыемстваў, корчмаў і г. д.), крыніцы і памеры прыбыткаў. 2-я частка апісвае воласці па вёсках, мястэчкі і гарады па вуліцах, якія ўваходзілі ў склад феад. ўладання. Пералічваюцца ўсе двары з паказаннем колькасці зямлі, сенажацяў, прысядзібных участкаў. У 16 — 1-й пал. 17 ст. пералік валасцей праводзіўся па валоках (дзе не было валочнай памеры — па службах). Пры кожнай валасці называліся ўсе сяляне, якія карысталіся яе доляй. У 2-й пал. 17 — 70-х г. 18 ст. пераважаў павалочна-падворны пералік, побач з валокамі выкарыстоўваліся і сялянскія двары — дымы. У І. гэтага часу — звесткі пра гаспадара і працаздольных членаў яго сям'і (мужчын), пра рабочую жывёлу, пчальнік. Найб. падрабязныя І. складзены ў апошняй чвэрці 18 ст.: апісаны кожны двор, называюцца ўсе чл. сям'і гаспадара, іх узрост, пол і г. д.; памеры надзела, угоддзі, рабочая і прадукцыйная жывёла, віды і памеры павіннасцяў, адыход чл. сям'і на заработкі, ўцёкі сялян, рамесныя прафесіі сялян і гараджан, часам наяўнасць у гаспадарцы наёмных работнікаў і пасевы. 3-я частка І. пералічвае розныя віды феад. павіннасцяў, узносы духавенству, дзярж. падаткі, вызначаліся іх памеры, спосаб вылічэння, тэрміны ўплаты. Тут жа падаваліся ўмовы карыстання вадаёмамі, пашаю, лясны мі ўгоддзямі. У некаторых І. змяшчаліся інструкцыі, як весці фальварковую гасп., апісанне межаў маёнткаў, рэестры запазычанасці сялян, геадэзічныя апісанні, планы ўчасткаў і інш. Кароткія ці няпоўныя І. змяшчалі звесткі толькі пра папскую гасп. ці пра воласць. Разнавіднасцю такіх І. былі т. зв. «берчакі» — пералік сялянскіх гасп. з паказаннем надзелу, натуральнага і грашовага чыншу. І. складаліся, як правіла, па ініцыятыве феадалаў і для іх патрэб, рэгулявалі іх узаемаадносіны з насельніцтвам, а таксама паміж зямельным уласнікам і фактычным уладальнікам і мелі дагаворную сілу для гэтых бакоў. І.— найважнейшыя, найб. масавыя і комплексныя крыніцы па гісторыі агр. адносін, с. гасп., гарадоў і мястэчак, рамяства, прамысловасці і гандлю. Маюць каштоўнасць для дэмаграфіі, этнаграфіі, мовазнаўства, гісторыі архітэктуры. Як гістар. крыніцы даволі дакладныя, бо складаліся на месцы шляхам агляду і апытвання насельніцтва, а часам і абмеру ў прысутнасці прадстаўнікоў ад сялян ці гараджан. Невялікая частка І. апублікавана ў «Актах Віленскай археаграфічнай камісіі», «Актах Заходняй Расіі», «Гісторыка-юрыдычных матэрыялах» і інш. выданнях. Асн. маса І. захоўваецца ў архівах СССР і ПНР. Звесткі пра абавязковыя І. 40—50-х г. 19 ст. гл. ў арт. *Інвентарныя правілы.*

Публ.: Инвентари Литвы XVII в. Сборник документов, сост. К. Яблонскис и М. Ючас, Вильнюс, 1962; Белоруссия в эпоху феодализма. Сб. документов и материалов, т. 1—2, Мн., 1959—1960. Инвентари и хозяйственные документы магнатских владений Белоруссии XVI—XVIII вв. и инвентари помещичьих имений первой половины XIX в. как исторический источник, у кн.: Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы. 1962 г., Мн., 1964; Воронков И. А. Инвентари имений — важный источник по истории польской феодальной деревни, «Вопросы истории», 1959, № 4. *П. Р. Казлоўскі.* Мінск.

ІНВЕНТАРЫЗА́ЦЫЯ, праверка на прадпр. або ва ўстанове наяўнасці тавара-матэрыяльных каштоўнасцей, грашовых сродкаў, правільнасці разлікаў па абавязацельствах і патрабаваннях шляхам падліку, вопісу, узважвання і г. д.; адна з найважнейшых формаў кантролю за захаваннем сацыяліст. уласнасці; элемент *бухгалтарскага ўліку.* Бывае бягучая і гадавая, поўная і частковая. Праводзіцца спецыяльнай камісіяй. Парадак, метады і перыядычнасць І. вызначае Міністэрства фінансаў СССР ці адпаведнае міністэрства або ведамства.

ІНВЕ́НЦЫЯ (ад лац. inventio вынаходства, выдумка), невялікая інструментальная п'еса, напісаная паводле прынцыпу свабоднай *імітацыі.* Пашыраны, асабліва ў навуч. рэпертуары, двух- і трохгалосыя інвенцыі І. С. Баха.

ІНВЕ́РСАР, прыстасаванне, якое дае магчымасць пабудаваць лінію аднаго віду (напр., прамую) з лініі другога віду (напр., з акружнасці).



Аснова І.— шарнірны механізм. І. Пасельє (гл. схему) складаецца з двух роўнавялікіх стрыжняў *OA* і *OB* і роўнастароннягa шарнірнага паралелаграма. Калі пункт *M* (пры замацаваным пункце *O*) апісвае зададзеную лінію, то *M'* апісвае лінію, атрыманую *інверсіяй* зададзенай лініі з цэнтрам у пункце *O*. У тэхніцы І.— механізм для пераўтварэння кругавога руху ў прамалінейны, дзеля чаго дадаецца яшчэ адзін стрыжань *O'M=OM* і замацоўваецца пункт *O'*.

ІНВЕ́РСІЯ (ад лац. inversio пераварочванне, перастаноўка), 1) у мове — перастаноўка слоў ці словазлучэнняў, парушэнне звычайнага парадку. 2) У логіцы — пераўтварэнне суджэнняў (выказванняў) і інш. формаў у новае ўмоўнае суджэнне. 3) У геаметрыі І. адносна зададзенай акружнасці — пераўтварэнне пунктаў плоскасці гэтай акружнасці, пры якім кожнаму пункту *M*, адметнаму ад пункта *O*, адпавядае пункт *M'* той жа плоскасці; пры гэтым выконваюцца дзве ўмовы: *M'* знаходзіцца на прамяні, што праходзіць праз *O* і *M*; $OM \cdot OM' = r^2$, дзе *O* і *r* — цэнтр і радыус акружнасці. І. выкарыстоўваецца ў тэорыі механізмаў (гл. *Інверсар*), тэорыі геам. пабудаванняў і інш. 4) У камбінаторыцы — любое парушэнне нармальнага парадку двух элементаў, незалежна ад таго, знаходзяцца яны побач ці не. Напр., у перастаноўцы *bca* адносна *abc* парадак элементаў *b* і *a*, *c* і *a* утварае І.

ІНВЕ́РТАР (лац. inverto пераварочваць, зменьваць), 1) у вылічальнай тэхніцы — электрычная схема з адным уваходам і адным выхадам, дзе сігнал на выхадзе паяўляецца толькі тады, калі адсутнічае сігнал на ўваходзе. Выкарыстоўваецца для рэалізацыі лагічнай аперацыі «НЕ». 2) У радыётэхніцы — эл.

схема для змены палярнасці імпульсу на процілеглую ці для павароту фазы гарманічнага сігналу на 180°. 3) У электратэхніцы — вентыльны ператваральнік, які з дапамогай кіроўных эл. *вентыляў* (*ігнітронаў*, тыратронаў, тырыстараў) ператварае электрычную энергію пастаяннага току ў энергію пераменнага току.

Падзяляюцца па залежныя (І., вядзёныя эл. сеткай) і незалежныя (аўтаномныя). Залежныя І. выкарыстоўваюцца ў высакавольтавых лініях электраперадач, у сістэмах электрапрывода. Аўтаномныя шырока ўжываюцца як ператваральнікі частаты для электрапрывода, індукцыйнага нагрэву, люмінесцэнтнага асвятлення.

Літ.: Лабунцов В. А., Ривкин Г. А. и Шевченко Г. П. Автономные тиристорные инверторы, М.— Л., 1967; Ривкин Г. А. Преобразовательные устройства, М., 1970; Бедфорд Б. и Хофт Р. Теория автономных инверторов, пер. с англ., М., 1969. *Б. І. Фірага.* Мінск.

ІНВЕСТЫТУРА царкоўная (познелац. investitura, ад лац. investio адзяю), у сярэднія вякі цырымонія зацвярджэння духоўнай асобы на пасаду і ўвядзення ў сан епіскапа ці абата. Адначасова духоўнай асобе давалася зямельнае ўладанне.

Да канца 11 ст. права І. належала свецкай уладзе (каралю, імператару). Папства імкнулася падначаліць свецкія ўлады і мець права І. Найб. напружанай барацьба за І. была ў Германіі. Скончылася заключэннем кампраміснага Вормскага канкардату 1122, які замацаваў права духоўнай І. за папам, а свецкай — за імператарам. Спрэчкі па пытанні І. ў Францыі і Англіі скончыліся пагадненнем паміж каралямі і папам.

ІНВЕСТЫЦЫЯ (ад лац. investio адзяю), доўгатэрміновае ўкладанне капіталу ў прамысловыя, с.-г., транспартныя і інш. прадпрыемствы для атрымання прыбытку.

Бываюць І. дзяржаўныя, прыватныя; унутраныя (укладанні ў сваёй краіне) і знешнія (укладанні за мяжою). У эпоху імперыялізму, характэрнай рысай якога з'яўляецца *вывад капіталу*, растуць знешнія І. як сродак закабалення буйнымі імперыял. дзяржавамі эканомікі залежных краін, як сродак неакаланіялізму.

ІНГАЛЯЦЫЯ (лац. inhalare удыхаць), увядзенне лякарстваў у арганізм удыханнем.

Адрозніваюць І. прыродную і штучную. Прыродная — удыханне разрэджанага паветра ў гарах, насычанага солямі і вільгаццю на марскіх берагах, з бальзамічнымі выпарэннямі і азонам у хваёвых лясах і інш. Для штучнай І. выкарыстоўваюць лякарствы ў выглядзе дыму, пары, газу, пылу аэразоляў (вільготнага або алейнага туману) разам з паветрам або з кіслародам. І. лечаць хваробы верхніх дыхальных шляхоў і лёгкіх. Штучную І. робяць спец. апаратамі (інгалятарамі).

Літ.: Амелин А. Г. Туманы служат человеку, М., 1961; гл. таксама літ. пры арт. *Вуха хваробы*.

ІНГІБІТАРЫ (лац. inhibeo затрымліваю) у біялогіі (ферментатыўныя яды), рэчывы, якія стрымліваюць біяхімічныя рэакцыі (прыгнятаюць актыўнасць *ферментаў*). Напр., фторысты натрый замаруджвае ферментацыйныя працэсы вугляводнага абмену.

І. ўзаемадзейнічаюць з актыўным цэнтрам ці з інш. часткамі малекулы ферменту і перашкаджаюць утварэнню актыўнага прамежкавага фермента-субстратнага кампанента. Даследаванне прыроды і механізмаў дзеяння І. дало магчымасць высветліць атрутны ўплыў на арганізм цыянідаў, сульфідаў, вокіслу вугляроду, паслядоўнасць рэакцый пры гідролізе, браджэнні і інш. Вывучанне І. мае таксама значэнне для атрымання лякарстваў, прапіляддаляў, інсектыцыдаў.

Літ.: Яковлев В. А. Кинетика ферментативного катализа, М., 1965; Эмануэль Н. М. и Кнорре Д. Г. Курс химической кинетики, 2 изд., М., 1969; гл. таксама літ. пры арт. *Ферменты*.

ІНГРЭСІЯ (лац. ingressio уваходжанне), праніканне мора ў паніжэнні прыбярэжнага рэльефу пры павышэнні ўзроўню мора ці апусканні берага.

У выніку І. ўтвараюцца вузкія і доўгія залівы (Обская губа, Севастопальская і Балаклаўская бухты і інш.). Інгрэсійныя берагі вельмі зрэзаныя. Паводле паходжання залітых паніжэнняў І. бываюць ледавіковага, эолавага, структурна-дэнудацыйнага тыпаў расчляненняў.

ІНД, рака ў Кітаі, Індыі і Пакістане. Даўжыня 3180 *км*, пл. бас. 960 тыс. *км*². Пачынаецца на паўн.-ўсх. схілах хр. Кайлас (Тыбецкае нагор'е) на выш. 5300 *м*. Упадае ў Аравійскае м., утвараючы дэльту пл. 8 тыс. *км*². І. у вярхоўі цячэ на ПнЗ, у міжгорнай даліне паралельна галоўнаму ланцугу Гімалаяў. Вышэй прытока Гілгіт паварочвае на ПдЗ і прарываецца паміж Гімалаямі і Гіндукушам. Сярэдняе цячэнне ў нізкагорнай і ўзгорыстай мясцовасці. У ніжнім цячэнні І. перасякае зах. ч. Інда-Гангскай нізіны, шмат старых рэчышчаў. Найб. прытокі: левы — Панджнад (Сатледж); правыя — Шаёк, Гілгіт, Кабул. Жыўленне снегавое і ледавіковае ў верхнім цячэнні, дажджавое ў ніжнім (мусонныя дажджы). Перыяд найб. узроўняў вады сак.— вер., найменшых — снеж.— люты. Сярэдні гадавы расход вады каля Хайдарабада 3850 *м*³/*сек*. Сцёк завіслых часцінак за год у вусці 450 млн. *т*. Выкарыстоўваецца для арашэння. Каля г. Сукур І. перагароджаны Сукурскай плацінай. Суднаходны ад вусця да г. Дэраісмаілхан, для малых суднаў да г. Аток. Найб. гарады Хайдарабад, Карачы.

ІНДАВА Кацярына Восіпаўна [н. 8(21).12. 1916, в. Ажагі Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ.], савецкі гісторык. Д-р гістар. н. (1964). З сялян. Чл. КПСС з 1944. Скончыла Маскоўскі пед. ін-т (1938). З 1938 навук. супрацоўнік Дзярж. гістар. музея СССР. Удзельнік Айч. вайны. З 1949 навук. супрацоўнік Ін-та гісторыі АН СССР. Асн. навук. працы па сац.-эканам. гісторыі сялянства Расіі 18—19 ст. Адна з рэдактараў 1-га т. «Гісторыі БССР» у 5 т.

Тв.: Крепостное хозяйство в начале XIX века, М., 1955; Дворцовое хозяйство в России (первая половина XVIII века), М., 1964.

ІНДА-ГАНГСКАЯ РАЎНІНА, на Пн Індыі, у Пакістане і Бангладэш. Цягнецца ад Аравійскага м. да Бенгальскага заліва. Даўж. каля 300 *км*, шыр. 250—350 *км*, сярэдняя выш. 50—100 *м* над узр. м.

Паводле паходжання гэта глыбокі перадгорны прагін, які пачаў фарміравацца ў палеагене і паступова запаўняўся алювіяльнымі і марскімі напосамі да магутн. 8—9 *км*. Паверхня плоская. Водападзел паміж басейнамі Інда і Ганга дзеліць І.-Г. р. на 2 часткі — усх. і зах., якія паступова паніжаюцца да вусця Інда і Ганга і заканчваюцца забалочанымі дэльтамі. Клімат трапічны, мусонны, на У вільготны (ападкаў 1000—2000 *мм* за год), на З сухі (ападкаў 100—500 *мм* за год). Гал. рэкі Інд і Ганг са шматлікімі прытокамі. Шмат арашальных каналаў. Расліннасць на З пустынная і паўпустынная, на У трапічная лясная. На З глебы субтрапічных пустынь і чырвона-бурыя сухіх саванаў, на У чорныя і шэрыя трапічныя і карычнева-чырвоныя; у далінах Інда і Ганга алювіяльныя арашальныя. І.-Г. р. адна з найбольш густа заселеных раёнаў Зямлі. На ёй жыве больш за 200 млн. чал., большасць з іх займаецца сельскай гаспадаркай. Вял. гарады: Калькута, Дэлі, Лахор, Карачы, Дака. *М. С. Ратабыльскі.* Магілёў.

ІНДАЕЎРАПЕІСТЫКА, галіна параўнальна-гістарычнага мовазнаўства, якая вывучае *індаеўрапейскія мовы*.

ІНДАЕЎРАПЕЙСКІЯ МОВЫ, самая вялікая ў свеце сям'я сваяцкіх моў. На І. м. гаворыць каля паловы людзей свету. Яшчэ ў дагістар. часы былі пашыраны на велізарных прасто-



КАРТА СВЕТУ, ФІЗІЧНАЯ



Карта складзена і афармлена ў сакавіку 1972 г.
Падпісана да друку 29.V-1972г.



рах Азіі і Еўропы. Развіваліся ў выніку распаду і драбнення агульнаіндаеўрап. прамовы, якая існавала не пазней як у 4-м тысячагоддзі да н. э. Найболей верагодная прарадзіма індаеўрапейцаў — тэр. на Пн і З ад Чорнага мора. Блізкія паміж сабою І. м. прынята аб'ядноўваць у групы, сярод іх вылучаюцца: індыйскія, іранскія, славянскія, балтыйскія, германскія, раманскія, кельцкія, італійскія (гл. адпаведныя артыкулы). Паўнымі рысамі абліжаюцца паміж сабою індыйскія і іранскія, славянскія і балтыйскія, кельцкія і італійскія. У сям'і індаеўрапейскіх моў грэчаская, албанская і армянская мовы ўтвараюць самастойныя групы.

У 20 ст. знойдзены пісьмовыя помнікі дзвюх мёртвых груп: анаталійскай (на тэр. Турцыі) і тахарскай (на тэр. Кітая). Мёртвыя мовы ёсць у індыйскай (санскрыт, пракрыты), іранскай (авестыйская і старажытнаперсідская), славянскай (стараславянская, старажытнарускае, палабская), германскай (гоцкая і інш.), балтыйскай (старажытнапруская) і інш. групах. Ад некат. І. м. (фракійскай, ілірыйскай і інш.) абярэгліся толькі рэшткі эпіграфічнага і анамастычнага матэрыялу.

Свайства І. м. выяўляецца ў агульнасці грамат. будовы, якой характэрна флектыўнасць. Параўнальна-гістарычныя даследаванні І. м. даюць магчымасць выявіць генетычныя сувязі паміж імі, а таксама рэканструяваць фаналаг. сістэму, грамат. будову і асн. лексіку індаеўрап. прамовы, не засведчанай дакументамі. Некаторыя І. м. (славянскія, балтыйскія) зберагаюць флектыўную будову, некат. (англійская, французская і інш.) у працэсе развіцця ператварыліся ў мовы аналітычнай будовы. Адны групы І. м. надта павялічыліся колькасна (індыйскія, германскія, раманскія, славянскія), іншыя скарацілася (кельцкія). Англійская, руская, французская, іспанская, нямецкая сталі мовамі міжнар. зносін.

Літ.: Мейе А. Введение в сравнительное изучение индоевропейских языков, пер. с франц., М.—Л., 1938; Языки народов СССР, т. 1, М., 1966; Hirt H. Indogermanische Grammatik, Bd 1—7, Heidelberg, 1921—37; Krahe H. Indogermanische Sprachwissenschaft, Bd 1—2, Berlin, 1958—60.

В. У. Мартынаў. Мінск.

ІНДАКІТАЙ, паўвостраў на ПдУ Азіі. На У і Пд абмываецца Паўд.-Кітайскім м., на З — Бенгальскім зал., Андаманскім м. і Малакскім праліварм. Паўд. частка І. ўтварае п-аў Малаку. Паўн. граніца ад дэльты Ганга — Брахмапутры да дэльты Хангха. Пл. каля 2 млн. км².



Берагі І. слаба парэзаныя, прыродных бухтаў мала. Рэльеф вельмі складаны. Горныя хрыбты цягнуцца пераважна з Пн на Пд. На З хр. Ракхайн выш. да 3053 м, Танентаўнджы і інш.; на У хр. Чыліншон. Найвыш. пункт І. на ПдУ (3280 м, на тэр. В'етнама). Паміж горных раёнаў размешчаны шырокія рачныя даліны, якія ў цэнтры і на Пд пераходзяць у вялікія нізіны. Карысныя выкапні: волава, вальфрам, бансіты, радкія і каляровыя металы, нафта і інш. На большай ч. п-ва клімат трапічны, мусонны, на Пд — экватарыяльны. Сярэднія т-ра студз. ад 15—20 на Пн да 25 °С на Пд, ліп. 27—29 °С. Ападкаў у гарах і на ўзбярэжжы 1500—2500 мм (месцамі больш за 3000 мм) за год, ва ўнутраных нізінных частках да 700 мм. Рэкі (найб. Іравадзі, Менам, Меконг) многаводныя, на раўнінах суднаходныя, выкарыстоўваюцца таксама на арашэнне. Глебы чырваназемныя ападзоленыя, жаўтаземы, чырвона-бурыя, балотныя. У прыморскіх раёнах і ў ніжнім поясе горных схілаў, павернутых да мора, растуць вечназялёныя вільготныя трапічныя лясы, ва ўнутраных раёнах — лістападныя трапічныя лясы і саванны. На балоцістых нізінах зараснікі бамбуку, на ўзбярэжжы мангры. На І. размешчаны Тайланд, Камбоджа, мацерыковая ч. Малайзіі, большая ч. тэр. Бірмы, Лаоса, В'етнама.

ІНДАЛОГІЯ, сукупнасць навук, якія вывучаюць гісторыю, эканоміку, мову і літаратуру, матэрыяльную і духоўную культуру народаў Індыі.

Як навука І. аформілася ў канцы 18 ст. У 50-я г. 19 ст. ў вах.-еўрап. І. ўзнік марксісцкі кірунак, для фарміравання якога вял. значэнне мелі індалагічныя працы К. Маркса і Ф. Энгельса. У Расіі І. пачала развівацца ў 70—80-я г. 18 ст. Сапраўды комплекснае вывучэнне Індыі пачалося пасля Вял. Кастр. сацыяліст. рэвалюцыі. Савецкая І. вызначаецца асаблівай увагай да вывучэння барацьбы нар. мас за нац. і сац. вызваленне. Гал. цэнтры І. ў СССР: Ін-т усходазнаўства АН СССР (Масква, адд. ў Ленінградзе), Ін-т усх. моў пры Маск. дзярж. ун-це, ін-ты ўсходазнаўства АН Арменіі, Грузіі, Узбекістана, Таджыкістана.

Літ.: Губер А. А. Изучение Индии в Совет-

ском Союзе, М., 1954; Библиография Индии. Дореволюционная и советская литература на рус. яз. и языках народов СССР, М., 1965.

ІНДАНЕЗІЙСКІЯ МОВЫ, група моў аўстранезійскай сям'і. Да І. м. належаць яванская, сунданская, малайская, балійская, мадурская, бугійская, мальгашская, ілаканская і тагальская. Пашыраны на а-вах Індыйскага акіяна: Філіпінскіх, Вялікіх і Малых Зондскіх, Малукскіх, на в-ве Мадагаскар, п-ве Малака. На І. м. гаворыць каля 133,5 млн. чалавек.

Грамат. будова І. м. аглюцінатыўная. Словы і формы слоў утвараюцца з дапамогаю афіксаў і паўтарэння слоў. Дзеясловы і імёны не зменьваюцца, не маюць катэгорыі роду. Сінтакс. адносіны выражаюцца з дапамогаю парадку слоў і службовых слоў. У І. м. шмат лексічных запазычанняў з санскрыту, арабскай, партугальскай і галандскай моў. Графіка пісьмовых (яванскай, балійскай, бугійскай) інданезійскіх моў паходзіць ад індыйскіх сістэм пісьма. У малайскай з 19 ст. лацінскі алфавіт.

Літ.: Теселкин А. С. и Алиева Н. Ф. Индонезийский язык, М., 1960; Аракин В. Д. Индонезийские языки, М., 1965.

ІНДАНЕ́ЗІЯ, Рэспубліка Інданезія (Republik Indonesia), дзяржава ў Паўд.-Усх. Азіі. Займае каля 3 тыс. астравоў Малайскага архіпелага: Вялікія Зондскія (Суматра, Калімантан, Сулавесі, Ява), Малыя Зондскія, Малукскія, зах. частку а-воў Новая Гвінея (Зах. Ірыян) і Тымора. Пл. 1904 тыс. *км*². Нас. 124 млн. чал. (1971). Сталіца Джакарта. І. падзяляецца на 22 правінцыі, у т. л. «асобная вобласць» Джак'якарта і сталічная акруга Вял. Джакарта. [На ўклейках: карта і іл.].



Дзяржаўны лад. І.— прэзідэнцкая рэспубліка. З 1959 дзейнічае канстытуцыя 1945. На чале дзяржавы і ўрада прэзідэнт, які назначаецца Народным кансультацыйным кангрэсам (НКК) на 5 гадоў. Вышэйшы орган дзярж. улады — НКК. Дзейны кангрэс часовы, бо яго члены не выбраны, а назначаны прэзідэнтам. Заканадаўчыя функцыі ажыццяўляе Савет народных прадстаўнікоў, члены якога таксама назначаны прэзідэнтам.

Прырода. А-вы І. падзелены морамі (Яванскае, Сулавесі, Малукскае, Банда). Каля $^{9}/_{10}$ тэрыторыі — вял. а-вы. Берагавая лінія парэзана слаба. Берагі а-воў вулканічнага паходжання стромкія, астатнія пераважна нізкія, амаль усюды забалочаныя. Каля берагоў ёсць каралавыя рыфы. Зручных гаваней мала. Каля паловы тэр. І. займаюць складкавыя горы і пласкагор'і, складзеныя на Калімантане, Сулавесі, у Зах. Ірыяне (цэнтр. частка) і паўд.-ўсх. ч. Суматры найбольш з гранітаў і крышталічных сланцаў. На раўнінах пераважаюць асадкавыя і вывергнутыя пароды. Найвыш. пункт І. г. Джая (5029 *м* над узр. м.) у Зах. Ірыяне. Карысныя выкапні: нафта (на а-вах Суматра, Ява, Калімантан, Серам, у Зах. Ірыяне і пад дном прыбярэжных мораў), кам. вугаль (Суматра, Калімантан), волава, золата, серабро і інш. каляровыя металы, алмазы, сера. Большая частка тэр. І. ў актыўнай сейсмічнай зоне, каля 70 дзейных вулканаў (найб. Керынчы, 3800 *м* над узр. м.; Рынджані, 3726 *м*; Семеру, 3676 *м*), многа патухлых. Глебы пераважна чырваназёмныя латэрытныя, горныя латэрытныя, балотныя трапічныя, алювіяльныя, на ПдУ месцамі чырванабурыя саванныя. Клімат экватарыяльны, вільготны, на У в-ва Ява і на Малых Зондскіх субэкватарыяльны. Сярэднемесячная т-ра ўсіх месяцаў ад 25 да 28 °С. У гарах



Тыповы краявід на востраве Ява.

вышэй 1500 *м* над узр. м. бываюць замаразкі да −3 °С. Ападкі на працягу ўсяго года, 2000—3000 *мм* за год, на наветраных схілах гор да 4000 *мм*, толькі на ПдУ ападкаў 1000 *мм* за год, бывае засушлівы перыяд да 6 месяцаў. Рэкі кароткія, паўнаводныя амаль круглы год. Найбольшыя Капуас і Барыта (Калімантан), Кампар (Суматра). 80% тэр. І. пад лесам; на схілах гор да 1500 *м* над узр. м. вільготныя экватарыяльныя лясы, вышэй горныя вечназялёныя лугі. Ва ўсх. частцы в-ва Ява, на а-вах Сумбава, Флорэс, Алар лістападныя мяшаныя лясы і хмызнякі. У лясах каштоўныя пароды дрэў: жалезнае, камфоравае, чорнае, эбенавае, сандалавае. З жывёл характэрны: малпы (гібоны, арангутангі, танкацелыя макакі), насарогі, дзікія быкі (гаур, бантэнг), індыйскія буйвалы, з птушак — фазаны, яванскія паўліны, райскія птушкі. Многа змеяў, насякомых. У краіне 8 нац. паркаў і запаведнікаў агульнай пл. 13 тыс. *км*², ахоўваюцца рэдкія жывёлы — чапрачны тапір, малпа-насач, гіганцкі варан, яванскі насарог, алені замбар і мунтжак, паласаты кабан і інш.

Насельніцтва. Карэннае насельніцтва інданезійцы, складаецца з мноства народнасцей і этнічных груп. Найб. шматлікія яванцы, сунданцы, мадурцы, малайцы і мінагкабау. У І. жыве каля 3 млн. кітайцаў, больш за 100 тыс. арабаў і індыйцаў, невялікая колькасць еўрапейцаў (пераважна галандцаў). Дзярж. мова — інданезійская, склалася на базе мовы малайцаў Суматры. 87% веруючых мусульмане, 4% хрысціяне, астатнія вызнаюць будызм і індуізм. $^{2}/_{3}$ насельніцтва сканцэнтравана на а-вах Ява і Суматра. У гарадах жыве 25% насельніцтва. Вял. гарады (тыс. ж., 1968): Джакарта 4774, Бандунг 1085, Сурабая 790, Семаранг 596, Палембанг 563.

Гістарычны нарыс. Тэр. І.— адзін з цэнтраў фарміравання чалавека сучаснага тыпу. Выяўлены помнікі ніжняга і верхняга палеаліту, мезаліту і неаліту. У 2—5 ст. фарміраваліся першыя класавыя грамадствы. Да 7 ст. склаліся феад. адносіны. Прыкладна ў гэты перыяд стварылася магутная суматранская імперыя Шрывіджая. На Цэнтр. Яве ў 1-й пал. 8 ст. ўзнікла дзяржава Матарам. У 11 ст. яна аб'яднала пад сваю ўладу ўрадлівыя даліны Цэнтр. і Усх. Явы і в-ва Балі. У 13 ст. на Яве склалася імперыя Маджапахіт, якая ў 13—16 ст. была самай вял. сярэдневяковай агульнаінданез. дзяржавай. У 14 ст. распаўсюджваўся іслам, на Пн Явы ўзнікла самастойнае мусульм. княства. У 2-м дзесяцігоддзі 16 ст. імперыя Маджапахіт распалася на некалькі мусульм. княстваў. Барацьба паміж імі закончылася аб'яднаннем у 1575 б. ч. Цэнтр. і Усх. Явы ў дзяржаву Матарам. Незалежным астаўся толькі султанат Бантам. Далейшае самаст. развіццё інданез. феад. гр-ва перапыніла ўварванне еўрапейцаў. У 1511 партугальцы захапілі Малаку і некат. пункты на Малукскіх а-вах, устанавілі кантроль над вывазам

тавараў і марскімі гандл. шляхамі. З 90-х г. 16 ст. пачалося пранікненне галандцаў, якія ў 1602 стварылі акцыянерную нідэрландскую Ост-Індскую кампанію (ОІК). У 1641 галандцы захапілі ў партугальцаў Малаку, паступова расшырылі свае тэр. ўладанні на Яве. Барацьба інданез. народа супраць каланізатараў спалучалася з антыфеад. выступленнямі. У 17—18 ст. галандцы задушылі буйныя нар. паўстанні. Англа-галандскае саперніцтва ў раёне паўд. мораў перарасло ў вайну 1780—84. Яна падарвала магутнасць ОІК. У 1800 кампанія ліквідавана, а яе ўладанні адышлі да Галандыі. У 1811 тэр. І. захапілі англічане. Аднак паводле пагаднення 1814 вярнулі калоніі ў І. Нідэрландам. *Венскі кангрэс 1814—15* замацаваў гэтае пагадненне. Жорсткая эксплуатацыя інданез. народа прывяла да нар. антыгаландскай вайны 1825—30, у якой каланізатары з цяжкасцю перамаглі. Да 70-х г. 19 ст. яны ўстанавілі сваё панаванне над усім в-вам Суматра, акрамя султаната Ачэ, які заваёўвалі больш як 30 гадоў (1873—1904, партыз. барацьба не спынялася да 1913). Найб. моцныя пазіцыі ў І. пасля Нідэрландаў захапіла Вялікабрытанія. Уздым нац.-вызв. руху ў канцы 19 — пач. 20 ст. ў калан. і паўкалан. краінах, рэвалюцыя ў Расіі 1905—07 спрыялі ўзнікненню нац. арг-цый у І. Створаны ў 1911 на Яве Саюз ісламскіх гандляроў перарос у масавую арг-цыю Саюз іслама, якая паступова стала выразніцай агульнанац. інтарэсаў народа. Рабочы клас фарміраваўся пераважна на замежных прадпрыемствах. У пач. 20 ст. ўзніклі першыя прафсаюзы. У 1-ю сусв. вайну адбыліся сялянскія ўзбр. антыгаландскія выступленні.

Вялікі ўплыў на рэвалюцыянізацыю інданез. працоўных зрабіла Вял. Кастр. сацыяліст. рэв. На базе с.-д. саюза, засн. ў 1914 на Яве левымі галандскімі сацыял-дэмакратамі, узнікла *Камуністычная партыя Інданезіі* — КПІ (афіц. аформілася ў маі 1920). У 1923 адбылася падрыхтаваная КПІ ўсеаг. забастоўка чыгуначнікаў, у 1926—27 успыхнулі ўзбр. паўстанні інданез. народа. Галандскія ўлады задушылі нар. выступленні, разграмілі КПІ, а звязаныя з ёю прафсаюзы і арг-цыі забаранілі. У 1927 узнікла Нацыянальная партыя на чале з А. Сукарна. Яна абвясціла сваёй мэтаю незалежнасць краіны. У 1930 галандскія ўлады ліквідавалі партыю. У 1931 яна адрадзілася пад назвай Партыя Інданезіі (Партінда), ва ўмовах разгрому КПІ стала найб. папулярнай. Прадстаўнікі розных нац. арг-цый і камуністы стварылі (1937) масавую патрыят. арг-цыю Рух інданез. народа. Па яе ініцыятыве паліт. партыі І. аб'ядналіся ў Інданез. паліт. саюз.

У 2-ю сусв. вайну галандскія калан. ўлады ў І. капітулявалі (1942) перад яп. мілітарыстамі. Неабмежаванае самавольства яп. ваеншчыны выклікала рост вызв. руху (паўстанні 1942, 1944 і інш.). Узніклі тайныя арг-цыі Супраціўлення. У чэрв. 1945 А. Сукарна сфармуляваў «пяць прынцыпаў» арганізацыі незалежнай дзяржавы: стварэнне адзінай нац. дзяржавы на ўсёй тэр. І., мірныя і сяброўскія адносіны з усімі народамі, дэмакр. вырашэнне пытанняў дзяржавы прадстаўнікамі народа, забеспячэнне матэрыяльнага дабрабыту народа, верацярпімая рэлігійнасць. Гэтыя прынцыпы сталі платформай аб'яднання ўсіх патрыят. сіл. Ва ўмовах паражэння Японіі ў 2-й сусв. вайне патрыят. сілы І. абвясцілі 17.8.1945 незалежнасць краіны. Прэзідэнтам выбраны Сукарна. Была апублікавана канстытуцыя. У кастр. 1945 узнікла пагроза ваен. інтэрвенцыі імперыялістаў. У Джакарце (Батавія) высадзіліся англійскія, потым галандскія войскі. У барацьбе за незалежнасць аб'ядналіся ўсе сацыяльныя сілы І. Непадрыхтаванасць да калан. вайны, патрабаванні сусв. дэмакр. грамадскасці (СССР першы ў студз. 1946 выступіў у ААН супраць дзеянняў каланізатараў у І.) прымусілі ўрад Нідэрландаў пайсці на перагаворы, прызнаць у сак. 1947 дэ-факта рэспубліку І. ў межах Явы, Мадуры і Суматры. Рэспубліка разам з створанымі на інш. а-вах пад імперыял. кантролем «аўтаномнымі дзяржавамі» павінна была аб'яднацца ў Злучаныя Штаты Інданезіі (ЗШІ). Нідэрланды разглядалі прызнанне рэспублікі як часовую ўступку і рыхтаваліся да нападу на І. У ліп. 1947 яны пачалі супраць яе адкрытую вайну. Урад І. падпісаў 17.1.1948 Рэнвільскае пагадненне, паводле якога пад галандскай акупацыяй асталася б. ч. Явы і асн. нафтавыя і плантацыйныя раёны Суматры. Гэта абвастрыла ўнутрыпаліт. жыццё І. У 1948 правыя сілы справакавалі ў раёне Мадыуна ўзбр. сутычку, у час якой загінулі многія кіраўнікі КПІ. Нідэрланды выкарысталі становішча ў краіне для новых ваен. дзеянняў. Аднак пад націскам прагрэс. сіл у І. і за яе межамі абвясцілі аб перадачы суверэнітэту незалежнай дзяржаве ЗШІ. На канферэнцыі «Круглага стала» 1949 Нідэрланды дамагліся таго, што І. прыняла кабальныя ўмовы ў эканоміцы, фінансах, знешняй палітыцы, абароне і інш. У жн. 1950 ЗШІ сталі унітарнай рэспублікай. Прынята новая часовая канстытуцыя. Праімперыял. палітыка першых кабінетаў рэспублікі выклікала рашучы адпор нац.-дэмакр. сіл. У ліп. 1953 сфарміраваны ўрад на чале з левым нацыяналістам А. Састрааміджойо [1953—55]. Яго палітыка адлюстроўвала тэндэнцыі да аб'яднання нац.-дэмакр. сіл у іх барацьбе з рэакц. партыямі. У 1955 Усеінданез. нар. кангрэс стварыў нац. фронт барацьбы за Зах. Ірыян (аставаўся пад галандскім панаваннем). І. аднабакова скасавала (1956) пагадненні канферэнцыі «Круглага стала» 1949, спыніла выплату Нідэрландам калан. даўгоў. Расшыраліся сувязі з сацыяліст. краінамі. У 1956 заключана першае генеральнае пагадненне пра эканамічнае і тэхнічнае супрацоўніцтва і першае гандлёвае пагадненне з СССР (дыпламат. адносіны з 1950). Савецкі Саюз даў І. пазыкі на льготных умовах, памог будаваць некалькі прамысл. аб'ектаў, рыхтаваць навукова-тэхн. кадры. Рэакц. партыі, перш-наперш Машумі (засн. ў 1945) і правыя сацыялісты, спалучалі падрыўную дзейнасць ва ўрадзе з тайнай падтрымкай контррэвалюц. змоў і мяцяжоў. Падрыўная дзейнасць рэакцыі прывяла да ўрадавага крызісу. У час яго Сукарна выступіў (1957) з канцэпцыяй «накіроўнай дэмакратыі», паводле якой кіраваць краінай павінен быў урад, сфарміраваны з прадстаўнікоў усіх партый. Канцэпцыю прэзідэнта падтрымалі дэмакр. сілы. Лідэры Машумі адкрыта перайшлі да мяцежнікаў. Сепаратысцкія мяцяжы 1957—58 у асн. былі ліквідаваны. У снеж. 1957 у межах барацьбы за вызваленне Зах. Ірыяна прафсаюзы пачалі захопліваць галандскія прадпрыемствы. Кіраванне часткаю іх перайшло да арміі. На пач. вясны 1961 галандскія прадпрыемствы былі нацыяналізаваны. 17.8.1959 у прамове, якую называюць Паліт. маніфестам, Сукарна сфармуляваў 5 праграмных прынцыпаў («канстытуцыя 1945», «інданез. сацыялізм», «накіроўная дэмакратыя», «накіроўная эканоміка», «інданез. самабытнасць»). Паводле канстытуцыі 1945 Сукарна ў сак. 1960 распусціў выбарны парламент і замяніў яго новым, прызна-

Паліцыя разганяе дэманстрацыю студэнтаў, якія пратэстуюць супраць росту цэн у краіне. Джакарта. 1970.



чаным прэзідэнтам. У 1960 дэкрэтам Сукарна забаронены партыі Машумі і Сацыялістычная, спынены дыпламат. адносіны з Нідэрландамі. У 1962 дасягнута пагадненне з Нідэрландамі аб паступовым пераходзе Зах. Ірыяна пад кіраўніцтва І. (канчаткова пытанне вырашана ў 1969 пасля праведзенага ў Зах. Ірыяне рэферэндуму).

У 60-я г. ў І. склалася цяжкае эканам. становішча. Тэхн. і арганізацыйная непадрыхтаванасць інданез. кадраў да выкарыстання нацыяналізаваных галандскіх прадпрыемстваў выклікала рэзкае зніжэнне даходаў. Ваен. і дзярж. адміністрацыя нацыяналізаваных і новых дзярж. прадпрыемстваў выкарыстоўвала сваю службу для асабістага ўзбагачэння. Раслі карупцыя і хабарніцтва. Ажыццяўленне агр. рэформы 1960 і 8-гадовага плана развіцця 1961—69 затрымалася. Каб адцягнуць увагу ад унутр. цяжкасцей, урад І. праводзіў знешнепаліт. мерапрыемствы, накіраваныя на абвастрэнне адносін з Малайзіяй. У сувязі з выбраннем Малайзіі ў Савет Бяспекі І. абвясціла (1965) пра выхад з ААН (уступіла ў 1950, у 1966 аднавіла сваю дзейнасць у ААН). Ва ўмовах пагаршэння эканам. становішча, расчаравання мас у «накіроўнай дэмакратыі», актывізацыі рэакцыі і апазіцыі вярхоў арміі нарастала глыбокая палярызацыя сіл. Ваен. вярхі кансалідаваліся супраць КПІ і Сукарна. Пад уплывам кіраўніцтва кіт. кампартыі ў КПІ пашырыліся леваапартуніст. авантурыстычныя ідэі. Хвароба Сукарна ўскладніла сітуацыю ў краіне. У вер. 1965 камандзір батальёна аховы прэзідэнта Унтунг арганізаваў змову супраць вышэйшых службовых асоб сухапутных сіл. У ноч на 1.10.1965 былі забіты 6 вышэйшых генералаў. Група Унтунга абвясціла пра ліквідацыю контррэвалюц. змовы. Пазіцыя Сукарна да гэтых падзей была неакрэсленая. Кіраўніцтва КПІ ўхваліла дзеянні Унтунга, аднак заявіла, што гэтыя дзеянні — унутр. справа сухапутных сіл. Становішчам у краіне завалодалі ваенныя на чале з камандуючым сіл стратэгічнага рэзерву ген. Сухарта. Рэакцыя абвінаваціла камуністаў у арганізацыі змовы групы Унтунга і пачала масавы тэрор супраць дэмакр. сіл. Сотні тысяч камуністаў і прагрэс. дзеячаў інш. дэмакр. арг-цый былі па-зверску забіты. У час запозненых спроб супраціўлення на Яве загінула большасць кіраўнікоў КПІ. Указам 1966 афіц. забаронена КПІ і прапаганда марксісцка-ленінскіх ідэй. У 1967 Сухарта стаў выконваць абавязкі прэзідэнта, з 1968 прэзідэнт І. У 1967 прыняты закон пра заахвочванне замежных капіталаўкладанняў у эканоміку І. Рэзка скараціўся дзярж. сектар. Канфіскаваная замежная ўласнасць вернута ўладальнікам. У 1971 ва ўмовах востpай паліт. барацьбы адбыліся парлам. выбары. Найб. месц (227 з 460) атрымала арг-цыя «Аб'яднаны сакратарыят функцыянальных груп», у які ўваходзяць прафесійныя групоўкі, дзярж. служачыя і ўсе, хто не з'яўляецца чл. ніводнай паліт. партыі і падтрымлівае «новы парадак» у краіне. 100 парлам. мандатаў паводле спец. дэкрэта прэзідэнта належаць ваенным. Урад «новага парадку» абвясціў палітыку І. нязменнай.

Асноўныя палітычныя партыі і прафсаюзы. Нацыянальная партыя Інданезіі (НПІ). Засн. ў 1927. Выразніца інтарэсаў нац. буржуазіі. Нахдатул Улама (Саюз мусульманскіх багасловаў). Засн. ў 1926, партыя сельскіх эксплуататараў, заможных вярхоў вёскі і часткі сярэдняй гарадской буржуазіі. Мусульманскі саюз Інданезіі. Засн. ў 1923. Мусульманская партыя Інданезіі. Засн. ў 1968. Аб'ядноўвае буйныя мусульманскія арг-цыі краіны. *Камуністычная партыя Інданезіі.* Засн. ў 1920. Пасля падзей 1965 забаронена. Аб'яднанне рабочых-мархаэністаў. Створана ў 1952. Прафсаюзны цэнтр НПІ. Прафсаюзнае аб'яднанне рабочых-мусульман Інданезіі. Створана ў 1955. Кантралюецца партыяй Нахдатул Улама. Федэрацыя ісламскіх прафсаюзаў Інданезіі. Засн. ў 1947. Аб'ядноўвае 6 галіновых прафсаюзаў. Цэнтральная арганізацыя сацыялістаў-працоўных Інданезіі. Створана ў 1962.

Гаспадарка. І. аграрная краіна, каля 350 гадоў была калоніяй і агр.-сыравінным прыдаткам Нідэрландаў. Пасля заваявання незалежнасці (1945) створаны дзярж. сектар, нацыяналізавана маёмасць галандскіх каланізатараў (1958—61), распрацаваны планы эканам. развіцця на 1956—60 і 1961—68. У 1961 пачата агр. рэформа. Цяжкасці з-за барацьбы са знешнімі і ўнутр. ворагамі, пралікі ўрада ў эканам. палітыцы прывялі да пагаршання эканам. становішча. Пасля 1965 скарацілася вытворчасць, узмацнілася інфляцыя і выраслa знешняя запазычанасць (у 1966 склала 2,4 млрд. дол.). Прыняты закон аб замежных інвестыцыях адкрыў шырокі доступ замежнаму капіталу (ЗША, Японія, Вялікабрытанія, Нідэрланды) у эканоміку краіны, асабліва ў горназдабыўную і лясную прамысловасць. У 1968 на І. ў сусв. вытворчасці капіталіст. краін прыпадала каля 40% выт. натуральнага каўчуку (2-е месца ў свеце), 30 перцу, 12,6 пальмавага алею, каля 4 чаю, 9% волава (4-е месца ў капіталіст. свеце). Аснова эканомікі — с. гасп. Яна дае 60% нац. даходу і каля 80% паступленняў замежнай валюты. У с. гасп. занята больш за 72% самадзейнага насельніцтва. 85% даходу с. гасп. прыпадае на земляробства. Апрацоўваецца каля 12,7

Шахцёрскі пасёлак капальні золата на Зах. Яве.





млн. *га*, або 6,7% тэр. Значная частка ворнай зямлі належыць памешчыкам і ліхвярам. 30% сялян не мае зямлі, астатнія маюць менш як 1 *га* на гасп. Найбольшыя плантацыйныя гасп. на в-ве Ява і на Пн Суматры. Амаль уся прадукцыя каўчуку, чаю, кавы, кары хіннага дрэва, пальмавага алею і значная частка трысняговага цукру ідзе на экспарт. Сялянскія гасп. вырошчваюць на свае патрэбы рыс, кукурузу, маніёк, соевы боб, арахіс, батат, на экспарт — каўчук, каву, перац, тытунь, чай. Збор і раёны вырошчвання гал. с.-г. культур (тыс. *т*, 1968): рысу 25 507 (цэнтр. і ўсх. ч. Явы), кукурузы 3055 (усх. ч. Явы і Мадура), соевага бобу 455 (Ява), чаю 40,1 (зах. ч. Явы), кавы 120 (усх. ч. Явы і Пд Суматры), какавабобу 1,0 (цэнтр. ч. Явы), тытуню 110 (Пн і У Суматры, цэнтр. ч. і У Явы), каўчуку 750 (У Суматры, зах. ч. Явы і Калімантана). У 1968 было (млн. галоў): буйн. раг. жывёлы 6,8, свіней 2,7, авечак 2,5, коней 0,6. Развіта рыбалоўства (1209,4 тыс. *т* рыбы ў 1969) і марскі промысел (лоўля водарасцей, трэпангаў, чарапах, жамчужніц). Важнае значэнне мае выкарыстанне лясных багацяў (драўніна, смолы, дубільнікі), якія часткова ідуць на экспарт. Прамысловасць дае каля 14% валавога нац. прадукту (1967). У краіне 40 замежных нафтавых кампаній, у т. л. найбольшыя амер. «Калтэкс», «Станвак» і «Пан-Амерыкан ойл». Яны здабываюць 90% нафты. Ад яе экспарту замежныя манаполіі штогод атрымліваюць 80 млн. дол. прыбытку. У 1970 здабыта (тыс. *т*): нафты 41 800 (Суматра, У Калімантана і Явы, Серам, Зах. Ірыян); волава 19,0 (а-вы Банка, Белітунг, Сінкеп); баксітаў 1000 (а-вы Бінтан, Бантам); нікелевай руды 425 (Сулавесі); кам. вугалю 139 (Суматра, Калімантан, Ява, Сулавесі); прыроднага газу (1968) 4,28 млрд. $м^3$ (Суматра). Здабываюцца руды марганцу і медзі, алмазы, сера, золата, серабро, фасфарыты, спажыўная соль.

Цукровы завод у Джан'якарце.



У 1967 выпрацавана 2032 млн. *кват-гадз* эл. энергіі, з іх 41,8% даюць ГЭС (Ява). У апрацоўчай прамысл. каля 13 тыс. прадпрыемстваў. Найб. развіта харч. (рысаачышчальныя, чайныя, кававыя, тытунёвыя, алейныя, цукровыя, кансервавыя прадпрыемствы) і тэкст. прамысловасць. Першасная апрацоўка каўчуку (Ява, Суматра), выт. аўтапакрышак, камер, гумавага абутку ў Богары. Есць гарбарна-абутковыя, дрэваапр. (Сампіт, Банджармасін), металаплавільныя і металаапр., паравоза- і аўтарамонтныя, аўтазборачныя (Джакарта, Сурабая, Мадыун, Бандунг), суднабуд. (Джакарта, Сурабая, Медан, Амбон), хім. (у т. л. з-д каўстычнай соды ў р-не Сурабаі), хімныя (Бандунг, Гарут, Сукабумі) і цементавыя (Паданг, Сурабая) прадпрыемствы. З-ды па вытворчасці электралямпаў і радыёапаратуры (Сурабая, Бандунг, Джакарта). Саматужная выт. батыку (спец. афарбаванай тканіны), плеценых вырабаў, чаканка серабра, разьба па дрэве і інш. Даўж. чыг. 6,6 тыс. *км*, у т. л. 4,7 тыс. *км* на Яве і 1,9 тыс. *км* на Суматры, аўтамаб. дарог 83,3 тыс. *км*, у т. л. асфальтаваных 20,8 тыс. *км*. Вял. значэнне мае авіяцыйны і марскі транспарт. Гал. порты: Танджунгпрыяк (абслугоўвае Джакарту), Сурабая (Ява), Белаван і Палембанг (Суматра), Банджармасін (Калімантан) і Макасар (Сулавесі). Танаж гандл. флоту 598 тыс. бр. рэг. т (1969). У 1970 экспарт склаў 1163 млн. дол., імпарт каля 1180 млн. дол. ¾ экспарту прыпадае на каўчук, нафту і нафтапрадукты. Вывозіць І. алавяныя канцэнтраты, копру, каву, чай, тытунь, пальмавы алей, перац, сізаль, кару хіннага дрэва і хініну, мускатны арэх, лесаматэрыялы; прывозіць прадукты харчавання, бавоўняныя тканіны, вопратку, сыравіну і паўфабрыкаты, машыны і абсталяванне. Асн. партнёры ў гандлі: ЗША, Нідэрланды, Малайзія, Сінгапур, Японія, ФРГ, Вялікабрытанія. Грашовая адзінка — інданезійская рупія.

Узброеныя сілы І. складаюцца з сухап. войск, ВПС, ВМС і ваен. паліцыі. У 1970 мелі каля 365 тыс. чал., акрамя таго, больш як 120 тыс. чал. ваен. паліцыі. Узначальвае Вярх. галоўнакамандуючы — прэзідэнт, ён жа міністр абароны. Сухап. войскі (каля 275 тыс. чал.) складаюцца з брыгад. ёсць таксама больш за 100 асобных пях., парашутна-дэсантных, бронекавалерыйскіх і інш. батальёнаў. ВПС (больш як 50 тыс. чал.) маюць на ўзбраенні каля 550 баявых самалётаў і верталётаў, у т. л. 25 бамбардзіровачных. У ВМС (каля 40 тыс. чал.) — флот, авіяцыя ВМС і марская пяхота; на ўзбраенні больш як 170 баявых і дапаможных караблёў, у т. л. 1 цяжкі крэйсер, 6 падводных лодак, 7 эсмінцаў, 11 фрэгатаў і інш.

Ахова здароўя. Сістэма аховы здароўя прыватная, часткова дзяржаўная. Прыватная пераважна амбулаторная дапамога. Бюджэт на ахову здароўя 2,7% усіх выдаткаў (1965). Было (1965) 912 бальніц на 72,2 тыс. ложкаў (0,7 ложка на 1000 ж.). Працавала (1966) 3,7 тыс. ўрачоў (1 урач на 30,5 тыс. ж.). Нараджальнасць (1964) 29,7, агульная смяротнасць 14,0, натуральны прырост 15,7 на 1000 ж.; дзіцячая смяротнасць 77,4 на 1000 жывародженых. Найб. пашыраны брушны тыф, малярыя, малярыя, туберкулёз, дызентэрыя, трахома; інфекцыйны гепатыт, сіфіліс, фрамбезія, гліс-эндэмічная лепра.

Асвета, навуковыя ўстановы. Пачатковае навучанне абавязковае, аднак ахоплівае толькі палову дзяцей з-за цяжкага матэрыяльнага становішча працоўных, недахопу настаўнікаў, школьных памяшканняў, абсталявання, навуч. дапаможнікаў. Дзіцячыя сады прыватныя. Пач. школа 6-гадовая для дзяцей 6—12 гадоў; у 1968/69 навуч. гг. ў ёй займалася больш як 12 млн. вучняў. Сярэдняя школа платная, 6-гадовая, мае малодшую і старэйшую ступені, па 3 гады кожная. Навучанне ў сярэдняй школе накіроўваецца па трох напрамках: «А» (мова і л-ра), «В» (прыродазнаўства і матэматыка), «С» (эканоміка і грамадскія навукі). У 1968/69 навуч. гг. ў сярэдніх школах малодшай ступені займалася 1419,4 тыс. вучняў, старэйшай ступені — 165,4 тыс. чал. Многа рэліг. школ. Прафес.-тэхн. падрыхтоўка ажыццяўляецца на базе малодшай і старэйшай ступеняў сярэдняй школы. Самы буйны ун-т краіны — Цэнтр. ун-т І. ў Джакарце (з 1950). Б-кі: Цэнтр. б-ка прыродазнаўчых навук у Богары, б-ка Цэнтр. стат. ўпраўлення і Дзярж. б-ка — у Джакарце, б-кі пры ун-тах. У Джакарце Музей інданез. культуры. Інданезійскі ін-т навук, НДІ: с.-г. і вет. навук, гісторыі, геаграфіі і археалогіі, медыцыны, біял., фіз. і інш.

Друк, радыё, тэлебачанне. Тыраж газет у 1969 не перавышаў 600 тыс. экз. Найб. важныя на інданез. мове: «Merdeka» («Свабода»), выдаецца ў Джакарце; «Angkatan Bersendjata» («Узброеныя сілы»), выдаецца штабам узбр. сіл; «Berita Yudha» («Ваенныя навіны»), орган сухапутных сіл; «Suluh Marhaen» («Факел мархэна»), орган НПІ і Фронту мархэнізму; на англ. мове выходзіць газ. «Armed Forces Courier» («Кур'ер узброеных сіл»). Інфармацыю распаўсюджвае агенцтва «Антара». Радыё і тэлебачанне Рэспублікі Інданезіі, урадавыя службы.

Літаратура. Першы пісьмовы помнік л-ры І.— перапрацоўка ў 9 ст. інд. эпічнай паэмы (кавін) «Рамаяна». У 14—15 ст. паявіліся творы і на аснове яванскай міфалаг. спадчыны. Л-ра гістар., міфалагічнага і дыдактычнага характару ўзнікла ў сярэднія вякі ў сунданцаў, мадурцаў, балійцаў, бугаў і макасараў. З 15 ст. стваралася л-ра на малайскай мове, якая пазней развілася ў сучасную інданез. мову. У канцы 19 ст. паявілася прэса на малайскай мове. Адны з першых у жанры рамана выступілі ў 10—20-я г. 20 ст. пралет. пісьменнікі Семаўн і Марка Картадыкрома. У 20—30-я г. пераважаў бытапісальны, т. зв. адатны раман (Марах Руслі, Нур Сутан Іскандэр). Асветніцкія раманы на рамант. і сентымент. сюжэты пісалі Сутан Такдыр Алішахбана і Хамка. Патрыят. паэзія Рустама Эфендзі і Махамада Ямі на ў 30-я г. змянілася лірыкай паэтаў, аб'яднаных вакол час. «Пуджанга бару» («Новы пісьменнік») — органа нац. бурж. інтэлігенцыі. Вяршыня паэзіі гэтага перыяду — лірыка Санусі Пане і Аміра Хамзаха. Антыкаланіяльным пафасам прасякнуты раман Абдула Муіса «Няправільнае выхаванне» (1928), вершы Т. Асмарахадзі. У канцы 30-х г. узмацніліся рэаліст. тэндэнцыі ў л-ры І. (раман Армайна Пане «Ланцугі», апавяданні Х. Б. Ясіна, вершы Х. Бандахара). Уздым л-ры пасля абвяшчэння незалежнасці краіны (1945) звязаны з літ. рухам «Пакаленне 45-га года» на чале з паэтам Хайрылам Анварам. Творчасць прадстаўнікоў гэтага руху — празаікаў Ідруса і Прамудзі Ананты Тура, драматурга Утуя Татанга Сантані — вызначаўся свабодалюбным пафасам, гуманізмам і рэалізмам. У пач. 50-х г. частка пісьменнікаў (Прамудзья Ананта Тур, Утуй Татанг Сантані, Сітар Сітуморанг) аблізілася з «Таварыствам народнай культуры» (ЛЕКРА), якое адстойвала сувязь мастацтва і палітыкі, прапагандавала сацыяліст. рэалізм; другія замкнуліся ў сферы асабістых праблем (Трысна Сумарджа, Асрул Сані) ці эмігравалі (Ідрус, Махамад Балфас, Ахдыят Картаміхарджа). Падзеі 1965—66 прывялі да разгрому ЛЕКРА, да рэпрэсій многіх яго членаў. Найб. значныя літ. з'явы сучаснай І.— апавяданні В. С. Рэндры, Рамадана, вершы і апавяданні Аіпа Расідзі, проза Тохі Мохтара, Івана Сіматупана. У раманах Матынга Бушэ, апавяданнях Герсонга Пойка закранаюцца вострыя сац. праблемы.

Архітэктура, выяўленчае мастацтва. Мегалітычныя збудаванні І. належаць да стараж. культуры, якая захавалася да нашага часу на а-вах Ніяс, Сумба, Флорэс. У 7—8 ст. склалася культавая архітэктура Цэнтр. Явы. Храмы («чанды») складзены насуха з абчасаных камянёў, маюць простую кубічную форму, ступеньчаты цокаль і пірамідальнае завяршэнне. У 9—10 ст. будуюцца «чанды», прыпадобныя ўпершыню ў багатым скульпт. дэкоры — нежэмнай частках інданез. архітэктуры. Ствараюцца складаныя храмавыя комплексы («чанды» Сеўу і Плаосан каля Прамбанана; т. зв. Лара Джонгранг у Прамбанане). Вяршыня дасягнула І.— будыйскае свяцілішча Барабудур (800). Каменным рэльефы комплексу Лара Джонгранг вызначаюцца дынамікай, драматызмам, у 12—15 ст. у рэльефах храмаў пераважае дэкар. пачатак. Рэаліст. традыцыі стараж. скульптуры асталіся толькі на в-ве Балі. Архітэктуры часоў імперыі Маджапахіт (канец 13 — пач. 16 ст.) на в-ве Ява ўласціва свабодная асіметрычная кампазіцыя, дынаміка і мудрагелістасць формаў. На в-ве Суматра храмы («біпра») 11—14 ст. вызначаюцца маналіт ной пластатою. Балійскія храмы 14 ст. («пура») маюць багата аздобленыя разьбою каменныя вароты і шмат'ярусныя пабудовы, падобныя да пагады («меру»). У 16 ст. ў І. будаваліся палацы, мячэці, мінароты в драўлянымі павільёнамі, з 17 ст.— гарады (Батавія, сучасная Джакарта) і абудаванні (пераважна перайманне галандскай архітэктуры). Стараж. жывапіс абярогся толькі ў роспісах храмавых панеляў і пакрывалаў і ў мініяцюрах на пальмавых лістах. Каланізацыя І. галандскімі і інш. імперыялістамі затармазіла развіццё мастацтва. Вопыт еўрап. жывапісу прынёс у І. ў сярэдзіне 19 ст. Ш. Б. Радэн Салех, ён пісаў патрыят. кампазіцыі, пейзажы. У канцы 19 ст. С. С. Абдулах стварыў нац. школу пейзажу. У традыцыях жывапісу в-ва Балі (людзі, расліны, жывёлы зліваюцца ў адзінае дэкар. цэлае) выкананы работы мастакоў А. А. Г. Сабрата, І. Б. Мада (20 ст.). З 30-х г. 20 ст. развіваецца рэаліст. жывапіс, прысвечаны жыццю і барацьбе народа І. (С. Суджаёна, Б. Абдулах, А. Джал, К. Афандаі, Х. Нгантунг, Г. Хендра), скульптура, графіка. Сярод маст. рамёстваў І., якія маюць даўнія традыцыі,— разьба па дрэве і бамбуку, пляценне



Сустрэча мараплаўцаў. Фрагмент рэльефу на свяцілішчы Барабудур. Камень. Каля 800.

кашоў, цыновак, капелюшоў, выраб бранзалетаў і посуду з золата і серабра, арнаментаванай зброі, ткацтва і апрацоўка тканін (батык), ганчарства (керамічны посуд з паліхромным ці разьбяным арнаментам), апрацоўка скуры. З абвяшчэннем незалежнасці І. (1945) будаваліся новыя гарады, буйныя комплексы, у т. л. па праектах сав. спецыялістаў — спарт. комплекс (1959—62) і шпіталь (1962—63) у Джакарце. Пасля перавароту 1965 выяўл. мастацтва ў заняпадзе. Іл. гл. таксама на ўкл.

Музыка І. вызначаецца цеснай сувяззю з нар. побытам, танцам, т-рам. У ле ладавай аснове 5-гукавая сістэма селендро, якая расшыраецца да 7-гукавой сістэмы пелог. Характэрны развітая гетэрафонія і шматгалоссе, прымат меладычнага пачатку. Вяршыня муз. мастацтва І.— нац. аркестр гамелан (пераважаюць ударныя інструменты). Паванне галандскіх каланізатараў вяло да заняпаду нац. музыкі. Пасля ўтварэння незалежнай Рэспублікі І. ўзніклі спрыяльныя ўмовы для развіцця агульнаінданез. муз. культуры. Вядомыя музыканты—К. Сімандзютак, А. Пасарыбу. У г. Сола заснаваны кансерваторыя (1960), спец. школа інданез. класічнай музыкі.

Тэатр. Вытокі тэатр. мастацтва І. ў нар. урачыстасцях і нуставых цырымоніях. Харантэрныя формы: танец-драма, выкананы ніто карыстаюцца маскамі, сродкамі пантамімы і танца; ваянг-франг,



Танцоўшчыцы з вострава Балі.

ляльковы тэатр разнастайны, строга кананізаваны тэатр. сродкі, і інш. Папулярныя лялечны т-р марыянетак і цянявы т-р ваянг-куліт. У аснове сюжэтаў эпізоды інд. эпасу «Рамаяны» і «Махабхараты», інданез. паданні і хронікі. Паказы звычайна суправаджаліся аркестрам гамеланам. У 20 ст. ствараюцца сучасныя формы т-ра, спалучаюцца сродкі традыц. і новага т-ра, блізкага да вах.-еўрапейскага. Найб. значныя — лудрук і кетапрак. З 50-х г. у І. працуе Нац. тэатр. акадэмія і «Лембага драма І.» (Аддзяленне нац. драмы).

Кіно. З 1925 у І. пачаўся выпуск фільмаў на сродкі кіт. і галандскіх прадпрыемцаў (большасць фільмаў праслякнута духам каланіялізму). Пасля стварэння незалежнай Рэспублікі І. нац. кінематаграфія дасягнула пэўных поспехаў. Створаны фільмы пра барацьбу за незалежнасць, закранаюцца важныя сац. праблемы («Вялікі марш», «Лімпі», «Новае жыццё»). З канца 60-х г. выпускаецца да 60 фільмаў за год, аднак большасць фільмаў па-ранейшаму прывозіцца з Ганконга, Тайваня, таксама з Італіі.

Літ.: Ленін У. І. Прабуджэнне Азіі, Тв., т. 19 (Полн. собр. соч., т. 23); Мовчанюк П. М. Яванская народная война. 1825—1830 гг., М., 1969; Беленький А. Б. Национальное пробуждение Индонезии, М., 1965; Национально-освободительное движение в Индонезии (1942—1965), М., 1970; Жаров В. А. Индонезия на пути упрочения независимости (1949—1956), М., 1964; Проблемы современной Индонезии, М., 1968; Другов А. Ю. и Резников А. Б. Индонезия в период «направляемой демократии», М., 1969; Алешин Ю. Советско-индонезийские отношения в 1945—1962 гг., М., 1963; Фаризов И. О. Советско-индонезийское экономическое сотрудничество, М., 1964; Антипов В. И. Индонезия (Экономико-географические районы), М., 1967; Синорский В. В. Индонезийская литература. Краткий очерк, М., 1965; Рябинкин П. Искусство Индонезии, М., 1959; Изобразительное искусство Индонезии, М., 1962; Прокофьев О. Искусство Юго-Восточной Азии, М., 1967; Всеобщая история искусств, т. 2, кн. 2, М., 1961, т. 6, кн. 1, М., 1965; Восточный театр. Сб. ст., Л., 1929.

У. І. Анціпаў (пасельніцтва, гаспадарка); *Д. В. Дзопік* (гістар. нарыс да 16 ст.), *А. А. Губер* (гістар. нарыс з 16 ст.), *В. П. Галаванаў* (паліт. партыі і прафсаюзы, друк), *У. З. Клепікаў* (асвета), *В. Б. Парнікель* (літаратура). Масква; *Дз. П. Бялянкі* (ахова здароўя). Мінск.

ІНДАСТА́Н, паўвостраў на Пд Азіі. На З абмываецца Аравійскім м., на У Бенгальскім залівам. Паўн. граніца паміж дэльтамі Інда і Ганга. Даўж. з Пн на Пд каля 1,7 тыс. *км*,

з З на У (у самай шырокай частцы) 2 тыс. *км*. Пл. каля 2 млн. *км*².

Берагі І. пераважна нізкія, слаба парэзаныя. Амаль увесь І. заняты плато Дакан (сярэдняя выш. 900 *м* на З і 600 *м* на У), складзеным з метамарфічных і вывергнутых парод, вапнякоў і пясчанікаў. Да ўзбярэжжа плато прылядымаецца і ўтварае горы Зах. і Усх. Гаты. Уздоўж берагоў вузкія раўніны. На Пд Кардамонавы горы. Найвыш. пункт І. на Пд (г. Анаймуды, 2633 *м*). Карысныя выкапні: кам. вугаль, жал. руда, марганец, баксіты, слюды, манацытавыя пяскі, волата. Клімат трапічны мусонны. На І. размешчана ПАД. ч. *Індыі*. Найб. гарады: Бамбей, Мадрас, Хайдарабад.

М. В. Лаўрыновіч. Мінск.

ІНДЗЕЙЦАЎ АМЕРЫКІ МОВЫ, мовы карэннага насельніцтва Амерыкі. Колькасць іх разам з дыялектамі да 2 тыс. Да еўрап. каланізацыі (16 ст.) І. А. м. займалі амаль увесь кантынент і прылеглыя а-вы. Тэрыторыя іх пашырэння намнога паменшала, некат. мовы зніклі зусім. На І. А. м. гаворыць каля 25 млн. чал.

Моўная карта Амерыкі вельмі стракатая. Напр., у Калумбіі каля 80 жывых і каля 50 мёртвых індзейскіх моў. І. А. м. не ўсе вывучаны, таму генеалагічная і тыпалагічная класіфікацыя іх не лічыцца канчатковаю. Лепей за іншыя вывучаны мовы алганкінаў, атапаскаў, іракезаў, мускогаў, сіу, тлінкітаў, хайда, чынукаў і некат. інш. Вылучаюцца асноўныя сем'і (групы) І. А. м.: у Паўн. Амерыцы — алганкін-вакаш, сіу-хока, на-дэнэ, ненуці, тан'ё-юта-ацтэк; у Цэнтр. Амерыцы і Мексіцы — сіу-хока, тан'ё-ацтэк, макра-атомі, соке-мая, пая-ленка, тараска; у Паўд. Амерыцы — чыбча, кечуа і аймара, аравак, юнка-пуруа, тупі-гуарані, жэ, пана, чон, маскоі, тукана і інш. І. А. м. вельмі разнастайныя паводле грамат. уласцівасцей і не ўтвараюць фанетыка-грамат. адзінства. Характэрная рыса шэрагу індзейскіх моў — інкарпараванне (гл. *Інкарпаратыўныя мовы*). Адны мовы (дэладругія (напр., наваха) — танічны. Рабіліся спробы прасачыць генетычныя сувязі І. А. м. з алтайскімі, кітайска-тыбецкімі, аўстралійскімі і аўстранезійскімі. Некат. індзейскія народы (мая, ацтэкі, сапатэкі, кечуа, аймара) мелі пісьменнасць на ідэаграфічнай аснове. Лічаць, што пісьменнасць мая ўзнікла ў першыя ст. н. э. Есць меркаванні, што мелі пісьмо інш. карэнныя народы Амерыкі.

Літ.: Языки и письменность коренного населения Америки, у кн.: Народы Америки, т. 1, М., 1959; Les Langues du monde, Paris, 1952; Boas F. Handbook of American Indian languages, p. 1—2, Washington, 1911—1912 (Smithsonian institution, Bureau of American ethnology, Bull. 40), p. 3, Glückstadt u. a., 1938.

А. Я. Міхневіч. Мінск.

ІНДОЛ (орта-бензапірол), C_8H_7N, арганічнае рэчыва, бясколерныя (цямнеюць на паветры) крышталі, *t* пл. 52,5 °С, *t* кіп. 254 °С. Растваральніках. Належыць да *гетэрацыклічных злучэнняў*.

У прыродзе І. знаходзіцца ў выглядзе вытворных трыптафану (у бялках) і алкалоідаў (у раслінах). У свабодным стане ёсць у кам.-вуг. смале і ў некат. эфірных алеях, напр. у алеі кветак язміну. Адыгрывае важную біяхім. ролю. Ужываецца як сыравіна ў вытв. гетэрааўксіну (3-індалілвоцатнай к-ты) і трыптафану, выкарыстоўваецца ў фармацэўтычнай і парфум. прамысловасці.

Літ.: Несмеянов А. Н. и Несмеянов Н. А. Начала органической химии, кн. 2, М., 1970.

ІНДРАКОЎ Іван Васілевіч [н. 2(15).3.1915, в. Акчыкасы Курмышскага пав. Сімбірскай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1944. У Чырв. Арміі з 1941. Вызначыўся ў Рагачоўскім р-не Гомельскай вобласці. 25.6.1944 артыл. батарэя, якою камандаваў І., была акружана ворагам. Сіламі батарэі І. арганізаваў контратаку, прарваў акружэнне і вызваліў в. Вялікае Ляда. 30 чэрв. на шашы Магілёў — Бабруйск батарэя знішчыла 44 аўтамашыны і 2 танкі ворага. Служыць у Сав. Арміі.

ІНДУІЗМ, рэлігія, якая склалася ў Індыі ў перыяд ранняга сярэдневякоўя (IV—VI ст.) на аснове *брахманізму*.

Паслядоўнікі І. называюць сваю рэлігію ар'ядхарма («закон арыяў») або санатана-дхарма («вечны закон»). На чале пантэона багоў тройца (трымурці): Брахма (бог-стваральнік), Вішну (богхавальнік), Шыва (разбуральнік і стваральнік). Асн. догматы І.: дхарма (абавязак), сансара (ланцуг пераўвасаблення душы), карма (пераўвасабленне пасля смерці ў больш высокі ці больш нізкі стан у залежнасці ад выканання дхармы). Асн. кірункі і гал. культы І.— вішнуізм і шываізм. Каб аб'яднаць розныя рэліг. вераванні, І. прызнаў усіх багоў увасабленнямі (аватарамі) Вішну або Шывы. Напр., аватараю Вішну прызнаны Буда, што дазейнічала растварэнню будызму ў І. і страце ім у Індыі свайго ўплыву. У І. астаўся моцны ўплыў першабытных вераванняў (*анімізму, фетышызму, татэмізму*, культу продкаў), што выяўляецца ў пакланенні жывёлам (карове, вужацы і інш.) і раслінам (напр., лотасу).

Сучасны І.— складаны комплекс супярэчлівых вераванняў і абрадаў: ідалапаклонства і вытанчаны містыцызм, забарона прычыняць зло жывому і крывавыя ахвярапрынашэнні. І. адыгрывае рэакц. ролю ў грамадскім развіцці краіны, бо імкнецца прымірыць масы з прыгнётам і бяспраўем, абвяшчае грэшнай барацьбу за паляпшэнне свайго становішча, асвячае феадальна-каставы лад грамадства. Яго выкарыстоўвалі англ. каланізатары, якія распальвалі рэліг. фанатызм. Прагрэс. рух Індыі няраз выступаў супраць асноў дагматыкі І., за яго рэфармацыю (рух «бхакці» ў 16 ст., сікхізм у 17—18 ст., «Брахма самадж» і «Ар'я самадж» у 19 ст.). І. меў значны ўплыў на ідэалогію *гандзізму*. І. вызнае большасць насельніцтва Індыі (прыкладна 300 млн. чалавек). Яго прыхільнікі ёсць на Цэйлоне, у Бірме, Непале, Малаі, Інданезіі і інш.

Літ.: Ильин Г. Ф. Религии древней Индии, М., 1959; Кочетов А. Н. Буддизм, М., 1968; Боги, брахманы, люди. Четыре тысячи лет индуизма, пер. с чеш., М., 1969.

Ю. М. Манін. Мінск.

ІНДУКТАР, 1) магнітаэлектрычная *пастаяннага току машына* з ручным прыводам. Выкарыстоўваецца ў прыладах для вымярэння ізаляцыі эл. установак і інш. 2) Генератар пераменнага току нізкай (15—18 *гц*) частаты з ручным прыводам (гл. рыс.). Ротар яго — кальцавы шматполюсны пастаянны магніт, статар — шпуля (абмотка) з меднага ізаляванага дроту. Напружанне 50—70 *в*, магутнасць да 3,5 *вт*. Выкарыстоўваецца ў тэлефонных апаратах сістэм МБ (мясцовай батарэі), у камутатарах як запасная крыніца сігналаў выкліку, у апаратах чыгуначай сігналізацыі і інш. 3) Прыстасаванне для індукцыйнага нагрэву вырабаў. Робіцца з некалькіх віткоў меднага (пры вадзяным ахаладжэнні — унутры пустога) дроту. Мае форму саленоіда, праз які прасоўваюцца прызначаныя для нагрэву (паверхневай загартоўкі) вырабы (іл. гл. ў арт. *Індукцыйны нагрэў*).



Шматполюсны тэлефонны індуктар: *1* — дыск; *2* — ручка; *3* — вось (утулка); *4* — корпус; *5* — магніт (ротар); *6* — каркас статара; *7* — шпуля статара.

ІНДУКТЫЎНАСЦІ ШПУЛЯ (дросель), скручаны ў спіраль эл. праваднік, які мае значную *індуктыўнасць* пры малой ёмістасці і невялікім актыўным супраціўленні.

Змена току ў І. ш. выклікае змену яе эл.-магн. поля, у выніку чаго ўтвараецца эрс самаіндукцыі і павялічваецца індуктыўнае супраціўленне. І. ш. бываюць пастаяннай і зменнай індуктыўнасці; плоскія, цыліндрычныя і тараідальныя; з адна- і шматслойнай абмоткаю. Шырока выкарыстоўваюцца ў радыё- і электратэхніцы (вагальныя контуры, эл. фільтры і інш.), а таксама для абмежавання токаў каротказамыкання ў эл. установках (рэактары).

ІНДУКТЫЎНАСЦЬ (ад лац. inductio навядзенне), уласцівасць праваднікоў, па якіх праходзіць эл. ток, ствараць магнітны паток *самаіндукцыі*. Абазначаецца *L*.

Колькасна роўная адносінам створанага токам магнітнага патоку ψ да велічыні гэтага току *i* (І. статычная, $L_{ст}=\frac{\psi}{i}$) або адносінам іх дыферэнцыялаў (І. дынамічная, $L_{дын}=\frac{d\psi}{di}$). Вымяраецца І. у *генры*. Залежыць ад памераў і канфігурацыі праваднікаў, ад магнітнай пранікальнасці правадніка і навакольнага асяроддзя. І. улічваецца пры разліку трансфарматараў, ланцугоў пераменнага току і інш.

Літ.: Общая электротехника, Мн., 1968, гл. 3.

ІНДУКЦЫЙНАЯ ВЫМЯРАЛЬНАЯ СІСТЭМА, сістэма электравымяральных прылад пераменнага току, у якіх вярчальны момант



Схема прылады індукцыйнай вымяральнай сістэмы: *1* — спружына, якая стварае процідзейны момант; *2* — рухомы дыск; *3* — пастаянны магніт (заспакойвальнік ваганняў); *4* — электрамагніт паралельнага ланцуга; *5* — электрамагніт паслядоўнага ланцуга.

ствараецца пры ўзаемадзеянні магн. патокаў нерухомых электрамагнітаў з магн. полем токаў, што індуктуюцца ў рухомай частцы прылады (гл. рыс.).

Вярчальнае (звычайна бягучае) магн. поле ствараецца ў выніку ўзаемадзеяння двух ці больш пераменных магн. патокаў, якія не сумешчаны ў прасторы і не супадаюць на фазе. Гэтае поле індуктуе ў дыску віхравыя токі. Узаемадзеянне магнітнага поля віхравых патокаў з вярчальным полем электрамагнітаў стварае ў дыску вярчальны момант. Прылады І. в. с. простыя, танныя, устойлівыя да перагрузак, не адчувальныя да знешніх магн. уздзеянняў, але маюць значныя частотныя і тэмпературныя хібнасці. Ужываюцца ў *лічыльніках электрычнай энергіі* пераменнага току, дзе тэмпературныя хібнасці кампенсуюцца.

Літ.: Писаревский Э. А. Электрические измерения и приборы, М., 1970; Вострокнутов Н. Г. Электрические измерения, М., 1966; Электрические измерения, 3 изд., М.— Л., 1963.

ІНДУКЦЫЙНАЯ ЛОГІКА, раздзел логікі, які вывучае працэс атрымання агульных заключэнняў з прыватных і адзінкавых пасылак. Адносіны агульных і прыватных ведаў (гл. *Індукцыя*, а таксама *Дэдукцыя*) даследаваліся ўжо ў старажытнасці. У 17 ст. Ф. Бэкан сфармуляваў індукцыйныя метады вызначэння прычыннай сувязі паміж з'явамі. У цяперашні час многія праблемы І. л. вырашаюцца сродкамі *імавернаснай логікі*, напр. пытанне пра ацэнку гіпотэз з пункту гледжання іх ступені пацверджанасці на аснове толькі некат. часткі інфармацыі, заключанай у гіпотэзе.

Літ.: Уемов А. И. Индукция и аналогия, Иваново, 1956; Уэтерли Ф. Э. Основы индуктивной и дедуктивной логики, пер. с англ., Киев, 1894.

П. Дз. Пузікаў. Мінск.

ІНДУКЦЫЙНАЯ ШПУЛЯ (шпуля Румкарфа), прылада для ператварэння пастаяннага або пераменнага току нізкага напружання ў пераменны ток высокага напружання.



І. ш. (гл. схему) складаецца з ферамагн. стрыжня *4*, зробленага з тонкіх ізаляваных лістоў мяккай сталі або з пруткоў, першаснай абмоткі *2* з некалькіх дзесяткаў (соцень) віткоў тоўстага дроту і другаснай абмоткі *3* з некалькіх дзесяткаў тыс. віткоў тонкага дроту. Абедзве абмоткі насаджваюцца на стрыжань. Першасная падключаецца да крыніцы эл. энергіі *1* (акумулятара, гальванічнай батарэі, генератара) цераз перарывальнік *5*, які перыядычна замыкае і размыкае эл. ланцуг. З прычыны *электрамагнітнай індукцыі* ў другаснай абмотцы ствараецца эрс. Пры сілкаванні пераменным токам перарывальнік не патрэбны. Тады І. ш.— звычайны трансфарматар. Першая канструкцыя І. ш. зроблена Г. Румкарфам (Германія, 1852). І. ш. выкарыстоўваюцца пераважна для запальвання ў рухавіках унутранага згарання.

ІНДУКЦЫЙНЫ НАГРЭЎ, награванне цвёрдых, вадкіх ці газападобных целаў токамі, якія наводзяцца ў іх эл.-магн. полем. Устаноўкі І. н. высокапрадукцыйныя, добра паддаюцца аўтаматызацыі, лёгка ўключаюцца ў паточныя лініі. Пашыраны ў машынабудаванні, каляровай і чорнай металургіі. На з-дах БССР І. н. выкарыстоўваецца пры вырабе шасцерняў, падшыпнікаў і інш.

Выраб ці яго частку, што трэба нагрэць, уводзяць у індуктар (саленоід), які падключаецца да крыніцы пераменнага току з частатою 50—10^8 *гц* (рыс. *а*). Пераменнае магн. поле, створанае пры цыркуляцыі току ў саленоідзе, індуктуе ў вырабе токі, якія яго награюць. Каб нагрэць дыэлектрыкі (пластмасы, драўніну, харч. прадукты і інш.), іх змяшчаюць паміж пласцінак кандэнсатара (рыс. *в*),



Асноўныя тыпы індукцыйных награвальнікаў: *а* — для награвання пад загартоўку; *б* — для плаўлення металаў; *в* — для награвання дыэлектрыкаў; *1* — награвальнік; *2* — выраб, які награецца; *3* — тыгель.

які сілкуецца ад генератара з частатою 10^7—10^8 *гц*. Цяпло, утворанае токамі зрушэння, выдзяляецца раўнамерна па ўсёй таўшчыні вырабу. Пры камбінаваным І. н. выкарыстоўваюцца як электрычная *E*, так і магнітная *H* кампаненты эл.-маг. поля (напр., пры варцы шкла). І. н. плавяць метал у індукцыйных печах (гл. рыс. *б* і арт. *Электрычная печ*), награюць загатоўкі перад пластычнай дэфармацыяй (штампаванне, коўванне, пракатка), пры тэрмаапрацоўцы дэталяў. Для І. н. часта ўжываюцца тырыстары (паўправадніковыя вентылі) замест вярчальных пераўтваральнікаў частаты, што павышае ккдз устаноўкі, паскарае працэс награвання, зніжшае прапаёмкасць.

Літ.: Брицын Н. Л. Нагрев в электрическом поле высокой частоты, 3 изд., М.—Л., 1965; Донской А. В. и Звягин И. Е. Высокочастотные электротермические установки, М., 1967; Воскресенский В. В. и Ананьев В. П. Тиристоры в индукционных установках, М., 1969; Романовский С. Г. Индукционная сушка токами промышленной частоты, Киев, 1963. *Я. С. Мельнікаў.* Мінск.

ІНДУКЦЫЯ ў логіцы (лац. inductio навядзенне), спосаб разважання (розумазаключэння) і метад даследавання, пры якіх агульныя вывады робяцца на аснове ведаў пра адзінкавыя факты. Шырока выкарыстоўваецца пры пабудове паўных тэорый у біялогіі, фізіцы, матэматыцы (гл. *Матэматычная індукцыя*) і інш. Магчымасць атрымання агульнага вываду шляхам І. ў тым, што ўсякае адзінкавае (эмпірычны факт) мае частачку агульнага, і таму па асобных фактах можна вызначыць агульныя законы.

Адрозніваюць І. поўную і няпоўную. Пры поўнай І. агульны вывад пра клас прадметаў робіцца на аснове аналізу ўсіх прадметаў гэтага класа. Поўная І. дае дакладны вывад, патрабуе далейшага даследавання інш. метадамі (гл. *Аналіз і сінтэз, Даслед. Дэдукцыя*). Марксісцкая філасофія разглядае І. як неабходны бок працэсу пазнання аб'ектыўнага свету. Але гэты працэс не зводзіцца толькі да І., ці дэдукцыі, а патрабуе адзінства ўсіх формаў мыслення. Гл. таксама *Індукцыйная логіка, Імавернасная логіка.*

Літ.: Энгельс Ф. Диалектика природы, Мн., 1954; Ленін У. І. Філасофскія сшыткі, Тв., т. 38 (Поли. собр. соч., т. 29); Горский Д. П. Логика, М., 1963; Пузанков П. Д. Аналитическая способность мышления, Мн., 1965; Михайлова И. Б. Методы и формы научного познания, М., 1968. *Л. Р. Крайчанка.* Мінск.

ІНДУКЦЫЯ (у фізіцы), 1) працэс навядзення электрычных зарадаў у правадніках і дыэлектрыках, змешчаных у эл. полі (электрастатычная І.); 2) працэс намагнічвання цэлаў у магн. полі (магнітная І.); 3) працэс узнікнення эл. току ў праваднікy, які рухаецца ў магн. полі або знаходзіцца ў спакоі ў пераменным магн. полі (электрамагнітная І.); 4) велічыня, якая характарызуе напружанасць электрычнага (эл. І.) або магнітнага (магн. І.) палёў у матэрыяльных асяроддзях; 5) узнікненне электрарухальнай сілы пры руху намагнічанага цела (уніпалярная І.).

ІНДУКЦЫЯ МАТЭМАТЫЧНАЯ, гл. *Матэматычная індукцыя.*

ІНДУЛЬГЕНЦЫЯ (лац. indulgentia літасць, дараванне), у каталіцкай царкве грамата пра поўнае ці частковае адпушчэнне грахоў. З 12 ст. каталіцкая царква пачала шырока гандляваць І., што давала велізарныя прыбыткі. Адмена гандлю І.— адно з асн. патрабаванняў *Рэфармацыі.*

ІНДУРА, вёска ў Гродзенскім р-не. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Індура». За 25 *км* на Пд ад Гродна, на шашы Гродна — Ваўкавыск. 1549 ж., двароў 471 (1971). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, аддз. сувязі, сталовая, 7 магазінаў. Брацкая магіла сав. воінаў Айч. вайны.

Каля І. гарадзішча з магутнымі абарончымі збудаваннямі, за 0,5 *км* ад р. Індуркі. Даследавалі К. Т. Кавальская (1955) і П. А. Рапапорт (1959). Плошчка дыяметрам 16—18 *м*, умацаваная двума (з Пд3 трыма) валамі і ровам. Пры раскопках знойдзены кераміка з слав. арнаментам, жалезныя і касцяныя прылады працы і зброі, косці свойскіх і дзікіх жывёл, зярняты. Гарадзішча адносіцца да 11—13 ст. і было, мабыць, сядзібай феадала. Выяленыя рэчы вельмі блізкія да знаходак 11—13 ст. у Гродне.

Літ.: Гуревич Ф. Д. Древности Белорусского Понеманья, М.—Л., 1962.

Я. Г. Зяруга. Мінск.

ІНДУРКА, рака, левы прыток Свіслачы (бас. Нёмана). Даўж. 20 *км*. Цячэ ў Гродзенскім р-не. Паверхня вадазбору (84,8 $км^2$) плоска-хвалістая. Жыўленне мяшанае. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 0,47 $м^3/сек$.

ІНДУСТРЫЯ (ад лац. industria стараннасць, дзейнасць), тое, што і *прамысловасць.*

ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫЯ, стварэнне буйной, перш за ўсё цяжкай, прамысловасці для пераўтварэння краіны з аграрнай у прамысловую і далейшай перабудовы вытворчасці на аснове высокапрадукцыйнай тэхнікі. Характарызуецца больш хуткім развіццём прамысловасці, чым с. гасп., вядзе да тэхн. прагрэсу, замены дробнай вытворчасці буйной, развіцця гарадоў, вялікіх прамысловых цэнтраў. Мэты, змест, крыніцы, тэмпы і сацыяльна-эканамічныя вынікі І. залежаць ад характару вытв. адносін.

Мэта капіталіст. І.— атрыманне найб. прыбытку для прадпрыемцаў і манаполій. Адбываецца стыхійна і нераўнамерна, паглыбляе супярэчнасці капіталізму: паміж працай і капіталам (узмацняецца эксплуатацыя працоўных, расце беспрацоўе, інтэнсіўнасць працы); паміж вытворчасцю і спажываннем; вытворчасцю і абарачэннем; метраполіямі і калоніямі; паміж капіталіст. дзяржавамі ў іх барацьбе за рынкі збыту. Анархія капіталіст. вытворчасці, яе антаганіст. супярэчнасці стрымліваюць тэмпы І. Мілітарызацыя капіталіст. эканомікі надае прамысловасці аднабаковы характар, абвастрае нераўнамернасць прамысл. развіцця. Капіталіст. І. пачыналася звычайна з лёгкай прамысловасці, на развіццё якой патрэбны меншы капітал і ён хутчэй абарачаецца, раней акупляюцца выдаткі. Крыніцы накаплення ў для капіталіст. І.: эксплуатацыя працоўных сваёй краіны, захоп і рабаванне калоній, кантрыбуцыі, канцэсіі і кабальныя пазыкі.

Сацыяліст. І.— адна з найважнейшых умоў стварэння мат.-тэхн. базы сацыялізма і камунізма. Забяспечвае рост прадукцыйнасці працы, эканам. і абароннай магутнасці краіны, стварае матэрыяльныя перадумовы для сацыяліст. пераўтварэння дробнатаварнай гасп., перамогі сацыяліст. формаў вытворчасці, павелічэння ўдзельнай вагі рабочага класа, умацавання саюзу рабочых і сялян, пераадолення адсталасці нац. ускраін і хуткага росту ўсіх раёнаў краіны, паступовай ліквідацыі істотных адрозненняў паміж горадам і вёскай. Крыніцы сродкаў сацыяліст. І.: унутрыгасп. накапленні нацыяналізаваных прадпрыемстваў, даходы ад нацыяналізаванага знешняга

гандлю, дзярж. банкаўскай сістэмы, с. гасп., транспарту, дзярж. пазыкі, паслядоўнае правядзенне рэжыму эканоміі, павышэнне прадукцыйнасці працы, зніжэнне сабекошту прадукцыі і г. д.

У СССР курс на І. вызначыў XIV з'езд ВКП(б) (снеж. 1925). План І., як і план калектывізацыі, культурнай рэвалюцыі, распрацаваў У. І. Ленін. Асаблівасці і значэнне І. ў СССР у тым, што дарэвалюц. Расія ў тэхніка-эканам. адносінах была адсталая, СССР быў адзінай у свеце краінай дыктатуры пралетарыяту і ўмовы капіталіст. акружэння патрабавалі развіцця ўсіх галін цяжкай індустрыі, у першую чаргу цяжкага машынабудавання, вытворчасці сродкаў вытворчасці (групы «А»). Перавагі сацыяліст. эканомікі забяспечылі высокія тэмпы І. У СССР быў распрацаваны і паспяхова ажыццёўлены план *ГОЭЛРО*. За гады даваенных пяцігодак пабудавана 9900 буйных прамысл. прадпрыемстваў, шахтаў, руднікоў, эл. станцый, у т. л. Магнітагорскі і Кузнецкі металург. камбінаты, аўтазаводы ў Маскве і Горкім, Сталінградскі і Харкаўскі трактарныя з-ды, Уральскі і Краматорскі з-ды цяжкага машынабудавання, Дняпрагэс імя Леніна. Створаны галіны прамысловасці: металургія, машынабудаванне, вытворчасць турбін, металургічнага, горнага абсталявання і інш. На аснове І. хутка развівалася вытворчасць прадметаў спажывання (група «Б»). Да 1937 СССР выйшаў на 2-е месца ў свеце па аб'ёме прамысл. вытворчасці, абагнаўшы Вялікабрытанію, Францыю, Германію. Пасля Айч. вайны працэс І. працягваўся ў кірунку аднаўлення разбураных і буд-ва прамысл. прадпрыемстваў на новай тэхн. аснове. Далейшы ўздым цяжкай індустрыі — адна з гал. умоў стварэння мат.-тэхн. базы камунізма, тэхн. прагрэсу, умацавання эканам. магутнасці і абараназдольнасці Сав. дзяржавы, павышэння дабрабыту працоўных, перамогі сацыялізма ў эканам. спаборніцтве дзвюх сістэм.

Сацыяліст. І. карэнным чынам змяніла аблічча Беларусі. У 1913 прамысловасць Беларусі складалася з дробных прадпрыемстваў. У БССР да 1940 пабудавана больш як 1700 прадпрыемстваў, у т. л. *Гомельскі завод сельскагаспадарчага машынабудавання, Мінскі радыёзавод*, магілёўскія трубаліцейны і аўтарамонтны з-ды, *Віцебскі станкабудаўнічы завод імя С. М. Кірава, Бабруйскі фанера-дрэваапрацоўчы камбінат, Беларуская ДРЭС*, Барысаўская і Мінская ЦЭЦ, 860 рэканструявана (2 металаапр. з-ды ў Мінску, *Гомельскі станкабудаўнічы завод* імя Кірава, *Віцебскі станкабудаўнічы завод імя Кіментэрна*, маш.-буд. з-д у Магілёве і інш.). Валавая прадукцыя буйной прамысловасці Беларусі (у межах 1939) павялічылася да 1940 у параўнанні з 1913 у 23 разы, колькасць рабочых — удвая і склала 310 тыс. чал. У 1940 у БССР працавала 25,9 тыс. інж.-тэхн. работнікаў. Гар. насельніцтва вырасла ў параўнанні з 1913 амаль удвая і склала 1925 тыс. чал. У Айч. вайну прамысловасць рэспублікі разбурана. У 1944 валавая прадукцыя прамысловасці склала 5,3% даваеннага ўзроўню. Пасля Айч. вайны адноўлены даваенныя прадпрыемствы і пабудаваны новыя: Беларускі і Мінскі аўтазаводы, мінскія трактарны, падшыпнікавы, з-д аўтам. ліній, Гродзенскі хім. камбінат імя Прытыцкага, гомельскія ліцейны і хім. з-ды, Полацкі нафтаперапр. з-д, Магілёўскі аўтазавод, салігорскія калійныя камбінаты (гл. адпаведныя арт.) і інш. За гады Сав. улады ў рэспубліцы створаны і паскоранымі тэмпамі развіваюцца машынабудаванне, нафтаздабыўная, нафтаперапрацоўчая, хім., падшыпнікавая, эл.-тэхн., радыётэхн., электронная і інш. галіны прамысловасці. На аснове пераважнага росту цяжкай прамысловасці расце вытворчасць тавараў нар. ўжытку. За 1966—70 аб'ём прамысл. вытворчасці павялічыўся ў параўнанні з 1965 у 1,8 раза. У 1970 у БССР выпушчана 17,5% трактароў, 13,6 металарэзных станкоў, 49 калійных угнаенняў, 10,4 хім. валокнаў, 15,1 падшыпнікаў качэння, 5,7 грузавых аўтамашын, 13,5 веласіпедаў, 7 аконнага шкла, 10,4% клеенай фанеры ад агульнасаюзнай вытворчасці. Аб'ём прамысл. прадукцыі ў параўнанні з 1913 павялічыўся ў 101 раз, з 1940 — у 13 разоў, прадукцыйнасць працы адпаведна ў 18 і 4,9 раза. У 1971—75 вытворчасць прамысл. прадукцыі намечана павялічыць на 50—53%. Плануецца пабудаваць і ўвесці ў дзеянне *Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод*, з-ды аўтам. ліній у Баранавічах, электрарухавікоў у Лунінцы, трактарных раскідальнікаў у Бабруйску, шаўковы камбінат у Магілёве, прадзільна-нітачны камбінат у Гродне, закончыць буд-ва 3-й чаргі *Аршанскага льнокамбіната* і інш. Намечана ўвесці ў дзеянне *Беларускі шынны камбінат*, пачаць буд-ва 4-га калійнага камбіната ў Салігорску, трох тэкст. прадпрыемстваў у Гомельскай вобл., Асіповіцкага льнокамбіната.

Іншыя сацыяліст. краіны ў буд-ве сацыялізма выкарыстоўваюць вопыт і дапамогу СССР. Вял. значэнне мае ўзаемадапамога краін сацыяліст. садружнасці (гл. *Савет Эканамічнай Узаемадапамогі, Інтэграцыя эканамічная*). СССР і інш. сацыяліст. краіны аказваюць дапамогу ў правядзенні І. краінам, якія сталі на шлях незалежнага развіцця. На пач. 1970 у гэтых краінах дзейнічала 326 аб'ектаў, пабудаваных з дапамогаю СССР, з іх 40 металургічных і машынабудаўнічых з-даў, 32 электрычныя станцыі, у т. л. Асуанская ГЭС і металургічны з-д у Хелуане (АРЕ), металургічны камбінат у Бхілаі (Індыя) і інш. Гл. таксама *Прамысловасць.*

Літ.: Маркс К. Капітал, т. 1, Мн., 1952, разд. 13, 24; Ленін У. І. Чарговыя задачы Савецкай улады, Тв., т. 27 (Полн. собр. соч., т. 36); Ягож. Прамова на II Усерасійскім з'ездзе Саветаў народнай гаспадаркі 25 снежня 1918 г., Тв., т. 28 (там жа, т. 37); Праграма Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Мн., 1961; Жибарев П. Б. Индустриализация СССР — великий подвиг советского народа, М., 1969; Локшин Э. Ю. Промышленность СССР, М., 1964; Мировая социалистическая система хозяйства, т. 1, М., 1966, гл. 4; Экономика Белорусской ССР в строительстве коммунизма, Мн., 1967; Янчанка С. Я. Нераўнамернае развіццё цяжкай прамысловасці ў СССР, Мн., 1958; Нетылькин А. Т. В борьбе за индустриализацию, Мн., 1970; Экономика Советской Белоруссии 1917—1967, Мн., 1967; Ленинский план социалистической индустриализации и его осуществление, М., 1969; Экономическая история БССР, Мн., 1969; Социально-экономические преобразования в Белорусской ССР за годы Советской власти, Мн., 1970; Матэрыялы XXIV з'езда КПСС, Мн., 1971; Матэрыялы XXVII з'езда Камуністычнай партыі Беларусі, Мн., 1971.

У. І. Мазур. Мінск.

ІНДУСТРЫЯЛЬНЫЯ ІНСТЫТУТЫ, гл. *Політэхнічныя і індустрыяльныя інстытуты.*

ІНДУЦЫРАВАНАЕ ВЫПРАМЯНЕННЕ, выпрамяненне электрамагнітных хваляў атамамі, малекуламі і крышталямі пад дзеяннем знешняй радыяцыі. Існаванне І. в. прадказаў у 1917 А. Эйнштэйн, выходзячы з неабходнай умовы ўстанаўлення *тэрмадынамічнай раўнавагі* паміж выпрамяненнем і рэчывам.

У дыпольным прыбліжэнні імавернасць І. в. *фатонай* пры пераходзе атама з узбуджанага ўзроўню *2* на ўзровень з меншай энергіяй *1* роўна $P_{21}(\nu)=B_{21}(\nu)n h\nu$, дзе $B_{21}(\nu)$ — каэфіцыент Эйнштэйна, $h\nu$ — энергія фатона, ν — частата выпрамянення, n — колькасць фатонаў у адзінцы аб'ёму. Выпрамяненне, якое ўзнікае пры гэтым, распаўсюджваецца ў кірунку ўзбуджальнага выпрамянення і супадае з ім па частаце, фазе і палярызацыі. І. в. часткова кампенсуе аслабленне ўзбуджальнага патоку пры яго праходжанні праз паглынальнае рэчыва, яно эквівалентнае адмоўнаму паглынанню. І. в. ў актыўных асяроддзях з інверсіяй (адваротнай раўнаважнай) заселенасцю часцінак на ўзроўнях пераважае над паглынаннем, і выпрамяненне, якое праходзіць праз рэчыва, узмацняецца. На І. в. заснавана работа *квантавых генератараў* і *квантавых узмацняльнікаў.*

Літ.: Методы расчета оптических квантовых генераторов, под ред. Б. И. Степанова, Мн., 1968; Гайтлер В. Квантовая теория излучения, пер. с англ., М., 1956. *В. П. Грыбкоўскі.* Мінск.

ІНДЫВІДУАЛІЗМ (ад лац. individuum непадзельнае, асобіна), супрацьпастаўленне інтарэсаў асобы інтарэсам грамадства. Асабліва характэрна бурж. маралі і ідэалогіі. Спара-

джаецца эканам. адносінамі, заснаванымі на прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці і эксплуатацыі чалавека чалавекам. Бурж. ідэалогія ўсяляк прапагандуе і абгрунтоўвае прынцыпы І., імкнецца даказаць незалежнасць індывіда ад грамадства, прыродны характар *эгаізму*. Сацыялізм ліквідуе прыватную ўласнасць і гэтым падрывае сац. карэнні І. У сацыяліст. грамадстве адносіны паміж людзьмі грунтуюцца на прынцыпе *калектывізму*.

Літ.: Маркс К. и Энгельс Ф. Святое семейство, или Критика критической критики, Соч., т. 2; Их жа. Немецкая идеология, Соч., т. 3; Их жа. Манифест Камуністычнай партыі, Мн., 1968; Ленін У. І. Эканамічны змест народніцтва і крытыка яго ў кнізе пана Струве, Тв., т. 1 (Полн. собр. соч., т. 1); Баскин М. П. Кризис буржуазного сознания. Индивидуализм и его крах, М., 1962; Замошкин Ю. А. Кризис буржуазного индивидуализма и личность, М., 1966; Чалин М. Л. В плену индивидуализма, М., 1966. *І. Л. Рабкоў.* Мінск.

ІНДЫВІДУАЛЬНЫ РАБОЧЫ ЧАС, час, які затрачваюць асобныя таваравытворцы ці прадпрыемствы на выраб адзінкі пэўнага віду прадукцыі. Залежыць ад тэхн. узброенасці працы, майстэрства, кваліфікацыі работніка і інш. умоў вырабу тавараў. І. р. ч. можа супадаць, быць вышэйшы або ніжэйшы за *грамадска неабходны рабочы час*, які пры таварнай вытворчасці вызначае грамадскую вартасць тавару. Гл. таксама *Тавар*.

ІНДЫВІДУАЛЬНЫЯ СРОДКІ ЗАСЦЯРОГІ, сродкі засцярогі ад пападання ў арганізм, на скуру і адзенне атрутных, радыеактыўных і бактэрыяльных сродкаў. Падзяляюцца на сродкі аховы органаў дыхання і скуры.

Да першых адносяцца фільтравальныя і ізаляваль ныя процівагазы і рэспіратары: ачышчаюць заражанае паветра ад шкодных сумесей і тым самым засцерагаюць органы дыхання ад паражэння. Сродкі аховы скуры: касцюмы, камбінезоны, панчохі, пальчаткі, плашчы з прагумаванай тканіны і гумавыя боты. Пры адсутнасці спецыяльна выпрабаваных І. с. з. карыстаюцца самаробнымі процівапыльнымі маскамі з тканіны, ватна-марлевымі павязкамі і г. д. Надзейнасць засцярогі залежыць ад умелага карыстання гэтымі сродкамі.

Літ.: Гл. пры арт. *Засцярога ад зброі масавага паражэння.*

ІНДЫГІРКА, рака ў Якуцкай АССР. Даўж. 1726 *км*. Пл. бас. 360 тыс. *км*². Утвараецца ад сутоку рэк Хастах і Тарын-Юрах. Упадае ў Усх.-Сібірскае мора.

У вярхоўі цячэ па Аймяконскім нагор'і, потым перарэзае некалькі горных хрыбтоў. Рэчышча вузкае, камяністае, з порагамі. І. калля 67°30′ паўн. ш. выходзіць на балоцістую нізіну. За 130 *км* ад вусця пачынаецца дэльта (пл. 5500 *км*²) са шматлікімі рукавамі і пратокамі. Гал. прытокі справа — Нера, Мома; злева — Эльгі, Селенях, Уянцана мая — пач. ліпеня. Сярэдні гадавы расход вады 1850 *м*³/*сек*. У вусці вагопна-нагонныя ваганні (амплітуда 1,5—2 *м*). Суднаходная на 940 *км* ад вусця. Рыбалоўства (рапушка, муксун, чыр, нельма). *І. Я. Куксін.* Мінск.

ІНДЫГОІДНЫЯ ФАРБАВАЛЬНІКІ, сінтэтычныя арганічныя фарбавальнікі на аснове індыга і яго вытворных.

Індыга, $C_{16}H_{10}O_2N_2$ — арган. фарбавальнае рэчыва, парашок цёмна-сіняга колеру, амаль нерастваральны ў вадзе і ў арган. растваральніках. Раней здабывалі з індыгоідных раслін, з канца 19 ст. атрымліваюць сінтэтычна. З вытворных індыга часцей ужываюцца галагенавытворныя (напр., броміндыга), яны даюць афарбоўку ад сіняй да чырвона-фіялетавай і аліўкавай. Пры замене ў малекуле індыга групы NH серай атрымліваюць шэраг фарбавальнікаў, прасцейшы з якіх тыаіндыга чырвоны С дае сінявата-чырвоную афарбоўку. Колер афарбоўкі залежыць ад роду замяшчальнікаў і іх становішча ў малекуле індыга. І. ф. даюць трывалыя да святла і мокрых апрацовак афарбоўкі ад чырвонай да чорнай. Належаць да кубавых фарбавальнікаў (гл. *Антрахінонавыя фарбавальнікі*). Імі афарбоўваюць і друкуюць тканіны з цэлюлозных валокнаў, шэрсці і шоўку.

Літ.: Андросов В. Ф. и Голомб Л. М. Синтетические красители в текстильной промышленности, М., 1968; Богословский Б. М. и Лаптев Н. Г. Химия красителей, М., 1960.

ІНДЫЙ (Indium), In, хім. элемент III групы перыяд. сістэмы Мендзялеева, ат. н. 49, ат. м. 114,82. Адкрыты ў 1863. Належыць да *рассеяных элементаў*. У зямной кары знаходзіцца 2,5 · 10⁻⁵% па масе.

Прыродны І. складаецца з двух ізатопаў ^{113}In і ^{115}In. Гэта серабрыста-белы мяккі метал, *t* пл. 156,4 °С, *t* кіп. 2050 °С, шчыльн. 7310 *кг*/*м*³. Хім. аналаг *галію*. Растварэцца ў разбаўленых к-тах; вада і шчолачы на І. не дзейнічаюць. Пры награванні рэагуе з галагенамі і серай. Злучэнні І. атрутныя. Здабываюць з адходаў і паўпрадуктаў цынкавай, алавянай і свінцовай вытворчасці. Выкарыстоўваюць для антыкаразійных пакрыццяў, у вытв. лёгкаплаўкіх сплаваў і ў паўправадніковай тэхніцы.

Літ.: Блешинский С. В. и Абрамова В. Ф. Химия индия, Фрунзе, 1958; Трифонов Д. Н. Рассеянные элементы, М., 1964.

ІНДЫЙСКАЕ НАРОДНАЕ ПАЎСТАННЕ 1857—59 (Сіпайскае паўстанне), супраць англ. каланіяльнага прыгнёту. Выклікана нездаволенасцю розных колаў інд. насельніцтва бязлітаснай эксплуатацыяй каланізатараў.

Пачалося ў мai ў г. Мірут з выступлення сіпаяў — наёмных салдат англ. арміі, потым ахапіла розныя раёны краіны. Паўстанцы авалодалі амаль усёй Паўн. Індыяй. Партыз. барацьба пачалася ў Цэнтр. Індыі і ў Біхары. Гал. сілай паўстання былі сяляне і рамеснікі, але ўзначальвалі яго феадалы (Нана Сахіб, Лакшмі-Бай і інш.). Пазней вылучыліся нар. кіраўнікі (Маўлаві Ахмад-шах і інш.). Розныя мэты барацьбы перш-наперш у сялян і феадалаў (сяляне імкнуліся пазбавіцца не толькі калан. прыгнёту, але і феад. эксплуатацыі, вярнуць спадчыннае права на зямлю; феадалы дамагаліся манапольна эксплуатаваць інд. народ), феад. раздробленасць, этнічная стракатасць, рэліг. і каставыя адрозненні шкодзілі агульнаму выступленню інд. народа. Каланізатары выкарысталі велізарную ваен.-тэхн. перавагу сваёй арміі і ў 1859 задушылі паўстанне. Нягледзячы на паражэнне, І. н. п. прымусіла англ. ўрад змяніць сістэму кіравання Індыяй (ліквідацыя ў 1858 Ост-Індскай кампаніі, надпарадкаванне калоніі англ. кароне), выдаць законы пра замацаванне права ўласнасці памешчыкаў на зямлю і законы пра арэнду зямлі сялянамі, якія некалькі абмежоўвалі свавольствы феадалаў. І. н. п. аслабліла пазіцыі Вялікабрытаніі ў Азіі, разам з *Тайпінскім паўстаннем 1851—64* у Кітаі і Бабідскімі паўстаннямі 1848—52 у Іране было адказам народаў Азіі на калан. наступленне капіталіст. краін, асабліва Вялікабрытаніі. Вызв. барацьба інд. народа мела важнае значэнне для развіцця рабочага руху ў краінах Еўропы.

Літ.: Маркс К. и Энгельс Ф. О национально-освободительном восстании 1857—1859 гг. в Индии, М., 1959; Народное восстание в Индии. 1857—1859 гг. Сб. ст., М., 1957; Шаститко П. М. Нана Сахиб (Рассказ о народном восстании 1857—1859 гг. в Индии), М., 1967. *А. Дз. Зубар.* Мінск.

ІНДЫЙСКІ АКІЯН, трэці па велічыні акіян на Зямлі; паміж Азіяй, Афрыкай, Аўстраліяй, Антарктыдай. Умоўную мяжу з Атлантычным ак. праводзяць па мерыдыяне мыса Добрай Надзеі, з Ціхім ак. па паўн. ваходзе ў Малакскі праліў, паўд.-зах. беразе Суматры, паўднёвых берагах Явы, Тымора, Новай Гвінеі і Торэсаву праліву, на Пд ад Аўстраліі па мерыдыяне мыса Паўднёвага (на в-ве Тасманія). Пл. з морамі 74 917 тыс. *км*² (21% паверхні Сусв. акіяна). Сярэдняя глыб. каля 4 тыс. *м*. Аб'ём вады каля 291 945 тыс. *км*³.

Да басейна І. а. належаць моры: Чырвонае, Аравійскае, Андаманскае, Тыморскае, Арафурскае; найб. залівы: Адэнскі, Персідскі, Аманскі, Бенгальскі, Карпентарыя, Вялікі Аўстралійскі. Астравы І. а. мацерыковыя — Мадагаскар, Сакотра, Цэйлон, Вялікія і Малыя Зондскія; вулканічныя — Маскарэнскія, Кразе, Кергелен, Андаманскія; каралавыя — Мальдыўскія, Лакадыўскія, Чагас. Гл. карту на ўкл.

Рэльеф дна і тэктанічная будова. Ложа І. а. перасякаецца падводнымі хрыбтамі мезазойскага і кайназойскага ўзросту: Аравійска-Індыйскім, Цэнтр.-індыйскім (падзяляе акіян на зах. і ўсх. часткі), Усх.-Індыйскім, Маскарэнскім, Зах.-Індыйскім, Аўстрала-Антарктычным падняццем, Зах.-Аўстралійскім хр. і хр. Кергелен з адноснымі вышынямі 1—4 тыс. *м*. Паміж хрыбтамі найб. значныя катлавіны з глыбінямі 5—6 тыс. *м*: Аравійская, Самалійская, Мадагаскарская, Кразе, Цэнтральная, Зах.-Аўстралійская, Паўд.-Аўстралійская, Афрыканска-Антарктычная і інш. Каля Зондскіх а-воў самае глыбокае месца І. а.— Яванскі жолаб (7450 *м*). Зах. і паўн.-зах. часткі дна складаены з грапітаў і меза-кайназойскіх асадкавых парод. Рэльеф падводнага шэльфа і мацерыковага схілу ўтварыўся пад уздзеяннем складаных тэктанічных разломаў і пагружэння ўскраіны мацерыкоў. Найб. старажытная частка І. а.— вялізнае меза-палеазойскае базальтавае ложа на У і Пд. Яванскі жолаб утварыўся ў кайназойскі перыяд.

Донныя адклады. На мацерыковай водмелі тэрыгенныя іліста-пясчаныя і жвірова-галечныя адклады. У зах. ч. І. а. вапняковыя фарамініферавыя ілы, на ПнЗ — радыялярыевы іл. У катлавінах, асабліва на У, чырвоная глыбакаводная гліна. На Пд дыятомавыя ілы і іліста-шчабністыя адклады, якія ўтварыліся ад раставання плывучых ільдоў. Пападаюцца скопішчы жалеза-марганцавых канкрэцый.

Клімат на Пн мусонны, трапічны (т-ра 25—27 °С). Летам паўд.-зах. вільготныя вятры дзьмуць у перагрэтую з нізкім атм. ціскам Паўд. Азію. Зімой, калі мацярык ахалоджваецца да 20 °С, пераважаюць сухія паўн.-ўсх. вятры. У экватарыяльным поясе вятры слабыя, пераменныя, частыя штылі. На Пд ад палосы вільготнага экватарыяльнага клімату (т-ра 26—27,5 °С, ападкаў 2000—3000 *мм* за год) існуе Паўд.-Індыйскі максімум з вобласцю паўд.-ўсх. пасату, паміж трапічнымі і субтрапічнымі паясамі. Каля 30° паўд. ш. т-ра 20—25 °С, ападкаў 250—270 *мм*. У паўд. умераных шыротах пераважаюць зах. вільготныя цыкланічныя вятры. Т-ра паветра зніжаецца да 4 °С летам і 0, −8 °С зімой, атм. ападкаў 500—1000 *мм*. Пры блізу Антарктыды клімат халодны, т-ра летам 0, зімою −20 °С. Ападкаў 500—250 *мм* за год.

Гідралагічны рэжым. Паверхневыя цячэнні абумоўлены атм. цыркуляцыяй. На Пн пераважаюць мусонныя цячэнні, летам накіраваныя на У, зімою па З. Каля афр. берагоў пераменнае Самалійскае цячэнне цёплае зімою і халоднае летам. Міжпасатнае процівацячэнне выразнае паміж 3° і 8° паўд. ш. толькі зімою. Пастаяннае Паўд. Пасатнае цячэнне з адгалінаваннямі цёплых цячэнняў — Мадагаскарскага, Мазамбікскага і мыса Ігольнага. Кругазварот у Паўд. паўшар'і заканчваюць халодныя цячэнні Зах. Вятроў і Зах.-Аўстралійскае. Глыбінныя цячэнні ад Антарктыды і субтрапічных шырот пранікаюць на Пн да п-ва Самалі. Цёплыя, але шчыльныя глыбінныя воды Чырвонага м. і Персідскага зал. трапляюць у Аравійскае м.

Цеплавы баланс водаў І. а. на Пн больш за 140 *ккал*/*см*²; пад 50° паўд. ш., каля 30 *ккал*/*см*² у год. Т-ра вады на Пн 26—28 °С, каля 50° паўд. ш. 5—9, у субантарктычным поясе 0—1 °С. Салёнасць вады залежыць ад ападкаў і выпарэння. На Пн І. а. і ў паўд. субтропіках 35—36‰, у Чырвоным м. і ў Персідскім зал. да 40‰. У прыэкватарыяльным поясе і субантарктыцы 33—34‰. У высокіх шыротах плывучыя льды з айсбергамі даходзяць летам у сярэднім да 68—65° паўд. ш., зімою да 55°, а асобныя айсбергі да 35° паўд. ш. Колер вады ў трапічным поясе сіні, у антарктычных шыротах блакітны. Празрыстасць вады адпаведна да 50 *м* і 20—25 *м*. Кісларoду ў верхніх слаях ад 4,5 *мл*/*л* на Пн да 7—8 *мл*/*л* на Пд, на глыбінях 200—400 *м* скарачаецца да 0,2—2 *мл*/*л*. Прылівы ў адкрытым акіяне 1—2 *м*, у залівах 5—7 *м* (у вусці Ганга 5 *м*, каля Рангуна 7 *м*).

Раслінны і жывёльны свет. Воды І. а. ў трапічных шыротах багатыя на планктон. Назіраецца «цвіценне мора». Прадстаўнікі доннай флоры — бурыя, зялёныя і чырвоныя водарасці. Многа малюскаў (жамчужніц і інш.), каралаў, ігласкурых; характэрны лятучыя рыбы, тунцы, акулы, марскія чарапахі і марскія змеі, воды насычаны фасфарасцэнтным зоапланктонам, ад чаго бывае «свячэнне». Ва ўмераных і халодных шыротах чырвоныя і бурыя водарасці (фукусавыя, ламінарыевыя). Млекакормячыя: кіты, цюлені; ёсць пінгвіны.

Гісторыя даследавання. У стараж. і сярэднія вякі асваенне Пн І. а. праводзілі індыйскія, егіпецкія, фінікійскія і грэчаскія мараплаўцы. У 6—14 ст. вядомы плаванні арабаў, у 14—15 ст. кітайцаў. У 1497—98 Васка да Гама дасягнуў берагоў Індыі. У 1642—43 нідэрландзец А. Тасман упершыню прайшоў з І. а. ў Ціхі ак. паўд. шляхам. У 18 ст. І. а. вывучалі Дж. Кук і Ж. Лаперуз. У 19 ст. даследаванні праводзілі рускія мараплаўцы І. Ф. Крузенштэрн, Ю. Ф. Лісянскі, Ф. Ф. Белінсгаўзен, М. П. Лазараў, О. Е. Коцэбу, С. В. Макараў. У 1873—74 І. а. вывучала англ. экспедыцыя на «Чэленджэры». Вял. даследаванні правяла ў канцы 50-х — пач. 60-х г. 20 ст. міжнар. экспедыцыя па вывучэнні Індыйскага ак. («Эквалант» у 1961—62) з актыўным удзелам сав. вучоных на суднах «Віцязь» і «Об». Экспедыцыі дэталёва вывучылі будову дна, цячэнні, фіз.-хім. састаў водаў, мінеральныя і біял. рэсурсы І. а.

Эканамічнае значэнне. Праз І. а. праходзяць важныя водныя шляхі ў краіны Еўропы, Азіі, Аўстраліі і Амерыкі. І. а.— частка трасы паміж портамі Чорнага і Балтыйскага мораў і савецкага Д. Усходу. Асн. грузапатокі праз Суэцкі канал (часова не дзейнічае ў выніку ізраільскай агрэсіі 1967) або Кейптаўн (Паўд. Афрыка) у Індыю, Інданезію, Аўстралію. Самыя значныя порты: Бамбей, Калькута, Мадрас, Карачы, Чатагам, Каломба, Рангун, Сінгапур, Фрымантл, Порт-Элізабет, Дурбан, Адэн, Джыбуці, Абадан, Басра, Мена-эль-Ахмадзі, Рас-Танура. На долю І. а. прыпадае каля 5% сусв. ўлову рыбы. Ловяць тунцоў, макрэль, селядцоў, скумбрыю, вустрыц, васьміногаў, трэпангаў, чарапах і акул. Гал. раёны рыбалоўства каля паўд. берагоў Афрыкі, паўд.-ўсходніх — Аравійскага п-ва, Малабарскага берага (паўд.-зах. ўзбярэжжа п-ва Індастан). Трапічныя ўзбярэжжы — важны раён здабычы

жэмчугу і перламутру. У антарктычных водах кітабойны промысел.

Літ.: Муромцев А. М. Основные черты гидрологии Индийского океана, Л., 1959; Истошин Ю. В. Океанология, Л., 1969; Рельеф Земли, М., 1967; Михайлов С. В. Экономика Мирового океана, М., 1966; Яго ж. Мировой океан и человечество, М., 1969. *В. А. Дзяменцьеў.* Мінск.

ІНДЫЙСКІЯ МОВЫ, 1) група моў індаеўрапейскай сям'і. Адрозніваюць старажытныіндыйскія мовы (мова ведаў у сярэдзіне 2-га тысячагоддзя да н. э., санскрыт з пач. 1-га тысячагоддзя да н. э.), сярэднеіндыйскія мовы (з сярэдзіны 1-га тысячагоддзя да н. э. паралельна з санскрытам развіваліся пракрыты, якія больш, чым санскрыт, адлюстроўвалі жывую мову; найдаўнейшы з пракрытаў — мова палі), новаіндыйскія мовы (з канца 1-га тысячагоддзя н. э.). Новаіндыйскія мовы звычайна падзяляюць на 3 галіны: унутраную (заходняя хіндзі мова, урду мова, пенджабі, гуджараці, раджастані і інш.), прамежкавую (усходняя хіндзі) і знешнюю, якая падзяляецца на групы: паўночна-заходнюю (лахнда, сіндхі), паўднёвую (маратхі), усходнюю (орыя, біхары, бенгалі, асамская). Да ўнутранай галіны, апрача цэнтр. групы, некат. вучоныя далучаюць мовы пахары, якія паходжаннем належалі да дардскай групы, але яшчэ ў пракрыцкую эпоху зазналі вялікі ўплыў І. м. Да І. м. належыць таксама цыганская мова. На І. м. гаворыць 400 млн. чал.

Старажытныя І. м. былі тыповымі флектыўнымі мовамі з унутранай і вонкавай флексіямі, чаргаваннем галосных, багатай марфалогіяй (3 роды, 3 лікі, 8 склонаў, разгорнутая сістэма часоў і ладоў дзеяслова і дзеепрыметнікаў). У фанетыцы — групы зычных, дыфтонгі, складовыя «р» і «л», музычны націск. У сярэднеіндыйскіх мовах адбывалася пэўнае спрашчэнне сістэмы часоў і ладоў, выкарыстанне дзеепрыметнікаў для абазначэння прошлага часу, выпрацоўваўся больш стандартны парадак слоў. Новаіндыйскія мовы пры спрашчэнні марфал. выражэння скланення і спражэння развіваюць аналітычныя спосабы перадачы склонавых значэнняў (паслялогі) і дзеслоўных катэгорый; трацяцца зычныя на канцы слова і ў групах; у слоўнік пранікаюць многія запазычанні з санскрыту, з моў Усходу, а таксама з еўрапейскіх.

2) Умоўная, не зусім дакладная назва моў, пашыраных на тэр. Індыі, Пакістана, Бангладэш, Цэйлона і Непала. Б. ч. іх — індаеўрапейскія ўласна індыйскія мовы, іранскія (у т. л. афганская і белуджская), пашыраныя толькі ў Індастане дардскія мовы (у т. л. кашмірская), якія займаюць прамежкавае месца паміж іранскімі і індыйскімі. Тут пашыраны таксама дравідыйскія мовы, мунду, некат. тыбета-бірманскія і мон-кхмерскія мовы. Усяго налічваюць да 180 жывых моў Індыйскага субкантынента, на якіх гаворыць больш за 650 млн. чал.

Літ.: Зограф Г. А. Языки Индии, Пакистана, Цейлона и Непала, М., 1960; Бескровный В. М. Индийские языки, у кн.: Советское языкознание за 50 лет, М., 1967; Языки Индии, Пакистана, Непала и Цейлона. [Зб. арт.], М., 1968.

А. Я. Супрун. Мінск.

ІНДЫКАТАР (лац. indicator паказальнік), 1) прылада, прыстасаванне для вымярэння, запісу, вызначэння розных аб'ектаў, паказчыкаў (гл. *Індыкатар вымяральны, Індыкатар радыёлакацыйны, Індыкатарная лямпа*).

2) Рэчыва, хім. рэактыў, прэпарат, які дае магчымасць назіраць ход хім. працэсаў, рэакцый і вызначаць хім. элементы і злучэнні (гл. *Ізатопныя індыкатары, Індыкатары хімічныя*).



ІНДЫКАТАР ВЫМЯРАЛЬНЫ, прылада для вымярэння даўжыні, праверкі формы дэталяў машын і іх узаемнага размяшчэння. Лінейныя перамяшчэнні вымяральнага стрыжня І. в. ператвараюцца ў вуглавыя перамяшчэнні паказальнай стрэлкі. І. в. бываюць механічныя (гл. рыс.), электрычныя і інш. Пашыраны ў машынабудаванні.

ІНДЫКАТАР РАДЫЁЛАКАЦЫЙНЫ, прылада радыёлакацыйнай станцыі для сігналізацыі пра наяўнасць у зоне дзеяння радыёлакатара аб'ектаў (цэляў) і вызначэння іх каардынат. І. р. звычайна мае светлавую індыкацыю, зрэдку гукавую.



Становішча аб'екта адносна радыёлакатара: *а* — вызначэнне месца цэлі ў прасторы; *б* — экран індыкатара далёкасці; *в* — экран індыкатара кругавога агляду; *г* — экран індыкатара трох каардынат.

Адбіты ад аб'екта сігнал узнаўляецца на экране электроннапрамяневай трубкі як усплёск на лініі разгорткі ці як кантрастная светлавая плама. Становішча аб'екта (цэлі) адносна радыёлакатара вызначаецца каардынатамі: азімутам β, нахіленай далёкасцю *Д* і вуглом месца ε (гл. рыс.). На экране І. р. таксама ўзнаўляюцца сігналы апазнавання, маштабныя і інш. дапаможныя адзнакі.

ІНДЫКАТАРНАЯ ДЫЯГРАМА, графічнае адлюстраванне змены ціску пары ці газу ў цыліндры паршневай машыны ў залежнасці ад перамяшчэння поршня (каардынаты $p-V$) ці вугла павароту каленчатага вала (каардынаты $p-\varphi°$).



Атрымліваюць І. д. непасрэдна з рухавіка, які працуе, з дапамогай спец. прылады-індыкатара ці ў выніку тэарэт. разліку. З дапамогай дыяграмы вядзецца кантроль за работай рухавіка і выбіраецца для яго найб. рацыянальны рабочы рэжым. Плошча дыяграмы (гл. рыс.) прапарцыянальная карыснай рабоце газаў у цыліндры рухавіка за адзін рабочы цыкл.

Літ.: Бондарев В. А., Процкий А. Е. и Гринкевич Р. Н. Общая теплотехника, Мн., 1967.

ІНДЫКАТАРНАЯ ЛЯМПА (электронна-светлавы індыкатар, візуальны індыкатар настройкі), электрычная ці электронная лямпа для назірання за ўзроўнем напружання. Выкарыстоўваецца як паказальнік настройкі радыёапаратуры, нулявая прылада ў вымяральнай апаратуры, у эл.-тэхн. і электронных прыладах і прыстасаваннях для кантролю іх работы.

І. л. падзяляюцца на дзве асн. групы: 1) лямпы, у якіх эл. стан сістэмы характарызуецца наяўнасцю ці адсутнасцю свячэння. Да іх адносяцца лямпы напальвання, неонавыя індыкатары і інш.; 2) лямпы, у якіх стан сістэмы вызначаецца размяшчэннем ці формай светлавога сігналу. Да гэтай групы адносяцца лямпы візуальнага назірання выходных лічыльных прыстасаванняў, напр. рэгістрацыйныя неонавыя лямпы і лямпы знакавай індыкацыі.

ІНДЫКАТАРЫ ХІМІЧНЫЯ, рэчывы, якія даюць магчымасць устанавіць канец рэакцыі (пункт эквівалентнасці) пры тытраванні або вызначыць які-н. фізіка-хім. паказчык асяроддзя па лёгка бачных зменах, напр. па змене колеру раствору ці з'яўленні асадку. Адрозніваюць І. х. метадаў нейтралізацыі, акіслення-аднаўлення, асаджэння і комплексаметрычнага тытравання.

І. х. метадаў нейтралізацыі — слабыя арганічныя к-ты ці асновы, у растворы яны дысацыіруюць (гл. *Электралітычная дысацыяцыя*) і падлягаюць таўтамерным ператварэнням (гл. *Таўтаметрыя*), змеўваючы пры гэтым колер. Рэзкая змена афарбоўкі раствору адбываецца ў пункце эквівалентнасці ці паблізу ад яго. Пры акісляльна-аднаўленчых метадах ужываюць т. зв. рэдаксіндыкатары — арганічныя рэчывы, здольныя да абарачальнага акіслення ці аднаўлення. Колеры акіслены і аднаўлены форм розныя. У метадах асаджэння і комплексаметрычнага тытравання І. х. ўтвараюць пры заканчэнні рэакцыі адпаведна нерастваральныя афарбаваныя комплексныя злучэнні. Карыстаюцца хімічнымі індыкатарамі ў аб'ёмным аналізе, для вызначэння pH раствору *(вадародная паказчыка)*, акісляльна-аднаўленчага патэнцыялу. Гл. таксама *Тытраметрычны аналіз, Аналітычная хімія.*

Літ.: Крешков А. П. Основы аналитической химии, ч. 3, М., 1970; Карякин Ю. В. Кислотно-основные индикаторы, М.—Л., 1951.

Н. А. Поляк. Мінск.

ІНДЫКІ, птушкі сям. фазанавых атр. курыных. Свойскія І. паходзяць ад дзікіх амерыканскіх, мексіканскіх і гандураскіх. У Еўропу завезены ў 1530. Гадуюць амаль ва ўсіх краінах на высакаякаснае мяса.

Апярэнне густое, бронзавае, чорнае або белае. На галаве і шыі скурныя ўтварэнні без пер'я, з верхняй часткі дзюбы звісае скурны прыдатак. Індыкі важаць 16—20, індычкі 8—9, індычаняты (у 4—6 месяцаў) 4—7 *кг*. У мясе адкормленых І. каля 21% бялку і 30% тлушчу. Пачынаюць нясціся з 10—10,5 месяца. Перыяд яйцаноскасці 5 месяцаў. Індычка пры двухразовым камплектаванні матачнага статка дае 120—140 яец за год і больш за 200 *кг* мяса (жывая маса патомства). Сярэдняя працягласць племянного выкарыстання да 3 гадоў. На Беларусі пашыраны бронзавыя шыракагрудыя і маскоўскія белыя І. Гадуюць іх на Маладзечанскай птушкафабрыцы Мінскай вобл. і ў саўгасе «Хальч» Гомельскай вобл. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Птушкагадоўля.*

Літ.: Прево А. А. и Столляр Т. А. (сост.). Основы технологии крупного индейководческого хозяйства, М., 1967; Налібоцкі С. Б. і Нікалаева Ю. Н. Племянная птушкагадоўля, Мн., 1960.

В. М. Галушка. Жодзіна.

ІНДЫЯ, Рэспубліка Індыя (Republic of India), дзяржава ў Паўд. Азіі. І. належаць Андаманскія і Нікабарскія а-вы (аддзяляюць Бенгальскі заліў ад Андаманскага м.), Лакадыўскія а-вы (на ПдУ Аравійскага м.). Пл. 3281,1 тыс. км². Нас. 547 млн. чал. (1971). Сталіца Дэлі. У І. 19 штатаў і 8 саюзных тэрыторый. [На ўклейках: ілюстрацыі да раздзелаў Прырода (I), Гаспадарка (I), Архітэктура, Выяўленчае мастацтва (II, III)].



Дзяржаўны лад. І.— парламентарная рэспубліка. Дзейнічае канстытуцыя 1950. На чале дзяржавы прэзідэнт, які выбіраецца на 5 гадоў. Прэзідэнт назначае прэм'ер-міністра, зацвярджае ўрад і кабінет міністраў. Вышэйшая заканадаўчая ўлада належыць парламенту, які складаецца з Народнай палаты, члены яе выбіраюцца насельніцтвам на 5 гадоў, і Савета штатаў, большасць чл. якога выбіраецца прадстаўнікамі штатаў на 6 гадоў (1/3 перавыбіраецца кожныя 2 гады), а 12 членаў назначаюцца прэзідэнтам. Выканаўчую ўладу ажыццяўляе ўрад. На чале кожнага штата губернатар, які назначаецца прэзідэнтам. Кожны штат мае свой заканадаўчы сход і ўрад. Тэрыторыі кіруюцца цэнтральным урадам. Суд. сістэма: Вярх. суд, вышэйшыя суды штатаў.

Прырода. На характары паверхні І. падзяляецца на 3 часткі: пласкагор'е Дэкан на Пд. на Пн горы *Гімалаі* і *Каракарум*, а паміж імі *Інда-Гангская*

У наваколлі горада Мадраса (злева).
Харвард. Завод цяжкага электраабсталявання, пабудаваны з дапамогай СССР.







Бенгальскі заліў каля Калькуты.

нізіна. Пласкагор'е Дэкан займае амаль увесь п-аў *Індастан*. Складзена з метамарфічных і вывергнутых парод, вапнякоў і пясчанікаў. Перасечана глыбокімі рачнымі далінамі з стромкімі схіламі. Сярэдняя выш. каля 900 *м* над узр. м. на З і 600 *м* на У. Дэкан прыўзняты на З (Зах. Гаты — 2339 *м*) і У (Усх. Гаты — 1680 *м*). На ПнЗ п-ва хр. Аравалі (1722 *м*) і плато Малва, уздоўж паніжэння Нармада-Сон горы Віндх'я і Сатпура, плато Чхота-Нагпур; на крайнім Пд — Кардамонавы горы, хр. Анаймалай і Палні з самай высокай вяршыняй Дэкана — г. Анаймуды (2698 *м*). Паміж Гатамі і морам вузкімі палоскамі (20—30 *км*) цягнуцца прыбярэжныя хвалістыя нізіны. Гімалаі і Каракарум — складаныя сістэмы гор і хрыбтоў мезазойскага і альпійскага ўзросту, парушаныя разломамі. Гімалаі спускаюцца ў бок І. трыма вялікімі ступенямі: Сівалік (800—1200 *м*), Малыя Гімалаі (2500—3000 *м*) і Вялікія Гімалаі (5500—6000 *м*). Найвыш. ў межах І. вяршыня Гімалаяў — г. Нангапарбат (8126 *м*), у Каракаруме — г. Чагары (8611 *м*). У гарах значныя ледавікі. Снегавая мяжа на выш. 5100—5300 *м*. Ледавікі спускаюцца да выш. 4000—3000 *м*. Інда-Гангская алювіяльная нізіна размешчана на месцы тэктанічнага прагіну, які ўзнік у палеагене, слаба нахілена да нізоўяў Інда на З і Ганга на У. Запоўнена марскімі адкладамі і рачнымі наносамі. Карысныя выкапні: жал. і марганцавыя руды, кам. вугаль, баксіты, манацытавыя пяскі, золата, спажыўная соль. У Асаме і на п-ве Катхіявар — нафта. Клімат на б. ч. Індыі трапічны, мусонны, на крайнім ПнЗ (у Кашміры) — горны субтрапічны і высакагорны. Сезоны адрозніваюць па атм. ападках: зімовы (снеж.—люты) сухі, халаднаваты; веснавы (сак.—май) найб. гарачы, засушлівы; летні (чэрв.—ліст.)

Нікабарскія астравы. Вёска ў пальмавым гаі.



вельмі вільготны (выпадае да 90% гадавой колькасці ападкаў) і менш гарачы. Макс. колькасць ападкаў у гарах Гаро-Кхасі-Джайнтыя (у Чэрапунджы сярэднія за многа гадоў каля 12 000 *мм*), на схілах усх. часткі Гімалаяў і Зах. Гатаў (Махабалешвар, 6807 *мм*). Засушлівыя раёны: ПнЗ Інда-Гангскай нізіны (Перым, 57 *мм*) і цэнтр. ч. Дэкана (Пахнадра, 325 *мм*). На астатняй тэр. І. выпадае ў сярэднім 1000—1500 *мм* ападкаў за год. Сярэднія т-ра студз. ад 15 (каля падножжа Гімалаяў) да 27 °С на Пд; мая — на б. ч. краіны ад 28 да 30 °С, а ў цэнтры Дэкана да 35 °С. Рачная сетка на значнай тэр. густая. Найб. рэкі: Ганг, Брахмапутра, Інд, Нармада, Гадавары, Крышна. Па характары жыўлення рэкі падзяляюцца на два тыпы: гімалайскі (дажджавое, мяшанае і ледавіковаснегавое) і дэканскі (дажджавое). Выкарыстоўваюцца для арашэння, буд-ва ГЭС і суднаходства. На б. ч. ўнутраных пласкагор'яў І. пераважаюць розныя тыпы чырваназемных і чарназёмападобных (рэгуры) глебаў. Рэгуры фарміруюцца на вулканічных пародах, вызначаюцца ўрадлівасцю. На ПнУ і ўздоўж зах. ўзбярэжжа Індастана пашыраны чырвоныя і чырвона-жоўтыя латэрытныя глебы. На Інда-Гангскай нізіне і на прыморскіх нізінах — урадлівыя алювіяльныя. У Гімалаях — вышынная пояснасць горных глебаў: бурых лясных, падзолістых і лугавых. Раслінасць багатая і разнастайная, месцамі моцна зменена чалавекам, у некат. раёнах прыродная раслінасць зусім знішчана. У засушлівых раёнах Дэкана і на З Інда-Гангскай нізіны — саванавая раслінасць з рэдкімі лясамі (парасонавая акацыя, дрэва сал, пальма), з калючымі хмызнякамі. На наветраных схілах Зах. Гатаў, ва ўсх. частцы Гімалаяў — вечнаяялёныя трапічныя лясы (дрэва сал, чорнае і чырвонае дрэвы, белы сандал) з мноствам эпіфітаў і ліянаў. На падветраных схілах Зах. Гатаў, на ПнУ Індастана і на У Інда-Гангскай нізіны — мусонныя (лістападныя) лясы, у якіх ападае лісце ў засушлівы перыяд. У Гімалаях добра выражана вертыкальная пояснасць раслінага покрыва ад трапічных лясоў да альпійскіх лугоў. Лясамі ўкрыта каля 18% тэр. І. Жывёльны свет: мноства малпаў (гібоны, макакі, танкацелыя хануманы), тыгры, гіены, плямістыя і чорныя леапарды, шакалы, у падножжы Гімалаяў — дзікія слоны, у густых зараснікаў уздоўж рэк — дзікія быкі гаур, бантэнг, на Зах. узбярэжжы (у запаведніках) — дзікія аслы і львы. У водах Ганга — кракадзілы. Пашыраны сухапутныя чарапахі, яшчаркі, змеі. Шмат птушак і насякомых. У краіне 6 нац. паркаў і 78 запаведнікаў агульнай пл. 18,5 тыс. км².

Насельніцтва. І.— многанацыянальная краіна. Пераважаюць нацыі і народнасці індаеўрапейскай і дравідыйскай моўнай сям'і. Да індаеўрапейскай групы адносяцца (млн. чал., 1969): хіндустанцы 133,4, маратхі 33,3, бенгальцы 33,9, гуджаратцы 20,3, біхарцы 16,8, орыя 15,7, раджастанцы 16,3, панджабцы 11, асамцы 6,8 — усе жывуць на Пн краіны. На Пд — народы дравідыйскай групы; да іх належаць (млн. чал., 1969): тэлугу 37,7, тамілы 30,6, канара 17,4, малаялі 17, а таксама тулу, кадагу, бадара, уралі і інш.; гондзі, араоны, кандхі — у Цэнтр. І. Народы мунда (санталы, мунда, хо, бхуміджы і інш.) жывуць у гарах Цэнтр. І. На мовах тыбета-бірманскай групы гавораць горныя плямёны і народнасці на Пн і ПнУ, уздоўж граніц Непала, Кітая, Бірмы (каля 3 млн. чал.). Дзярж. мова — мова хіндзі і часова англійская. 84% насельніцтва вызнаюць індуізм, каля 11 мусульмане, 2,5% хрысціяне. Найб. шчыльнасць у штатах Керала (435 чал. на 1 км²), Зах. Бенгалія (397) і Мадрас (259). У гарадах жыве 18% насельніцтва. Найб. гарады (тыс. ж., 1969): Дэлі 3621, Бамбей 5534, Калькута 3134, Мадрас 2048, Ахмадабад 1508, Хайдарабад 1295, Каннур 1164, Бенгалуру 1027, Пуна 718.



1



2



3



4

Інданезія.

1. Дзейны вулкан на востраве Ява.
2. Бандунг. Вуліца Азіі і Афрыкі.
3. Рысавыя палі на востраве Ява.
4. Джакарта. Шпіталь дружбы — дар Савецкага Саюза інданезійскаму народу.
5. Ступа на верхніх тэрасах Барабудура. Каля 800.
6. Комплекс Лара Джонгранг (у цэнтры храм Шывы) у Прамбанане. 2-я пал. 9 ці пач. 10 ст.
7. Багіня Праджнапараміта. Фрагмент. 13—14 ст. Музей. Лейдэн.
8. Сярод прыроды. Акварэль. Востраў Балі.



5



6



7



8


1


2


3


4


5

Індыя III. 1. Мінарэт Кутб-Мінар у Дэлі. Каля 1200. 2. Кваўлі і Гал. Музыка боскага кахання, самазабыцця і захаплення. Магольская мініяцюра. 17 ст. Дзярж. музей ў Берліне (у Далеуд-Даула ў Агры. 1628. 5. Д. П. Рой Чаўдхуры. Калі пачынаюцца дажджы. Тэмпера. Нац. галерэя сучаснага мастацтва. Дэлі. 6. Прыдворны з сокалам. Мініяцюра. Сярэдзіна 17 ст. Бібліятэка індыйскага таварыства. Лондан. 7. Буланд-Дарваза—партал саборнай мячэці ў Фатыхпур-Сікры. 1572. 8. Х. Дас. Пара галубоў. Каляровая гравюра на дрэве. Пач. 50-х г. 20 ст.


6


7


8



Адміністрацыйныя будынкі на плошчы Віджай Чоўк у Дэлі.

Гістарычны нарыс. Археал. знаходкі сведчаць, што тэр. І. заселена чалавекам з часоў палеаліту. У 14—12 ст. да н. э. ў І. прыйшлі плямёны т. зв. арыяў. Яны займаліся жывёлагадоўляй і земляробствам, былі знаёмы з рамяством. У 10—7 ст. да н. э. на поўначы І. ўзніклі дзяржавы Анга, Ватса, Магадха, Куру, Панчала і інш. Найб. магутнай была Магадха. Мяркуюць, што ў сярэдзіне 4 ст. да н. э. там былі рабаўладальніцкія адносіны. У сярэдзіне 4 ст. да н. э. Магадха пашырыла сваю ўладу амаль на ўсю даліну р. Ганг і, відаць, на Калінгу. У 327 да н. э. на тэрыторыю І. ўварваліся войскі Аляксандра Македонскага, але сустрэлі ўпартае супраціўленне і ў 325 мусілі адысці. Пры дынастыі Маур'я [322 (ці 314) — 187 (ці 185) да н. э.] Магадха валодала амаль усёй тэрыторыяй І. і часткай сучаснага Афганістана. Класавыя супярэчнасці ўнутры краіны і войны з бактрыйскімі грэкамі падарвалі магутнасць Магадхі. Яна распалася на некалькі дзяржаў (2 ст. да н. э.— 1 ст. н. э.). Большая частка Паўн. І. ў 1 ст. н. э. была пад уладай Кушанскага царства, пасля заняпаду якога зноў пачалося ўзвышэнне Магадхі (асабліва росквіт у 4—6 ст. пры Гуптах). Мяркуюць, што ў 2—4 ст. у І. пачаўся распад рабаўладальніцкіх адносін. Працэс феадалізацыі ўзмацніўся пасля заняпаду дзяржавы Гуптаў. Да канца 12 ст. тэрыторыя І. была раздроблена на некалькі дзяржаў, якія ваявалі паміж сабой. У канцы 12 — пачатку 13 ст. Паўн. І. завяваў правіцель Газні Мухамед і аб'яднаў ле з большай часткай Афганістана. Пасля смерці Мухамеда яго намеснікі ў Індыі стварылі дзяржаву з сталіцай у Дэлі (Дэлійскі султанат). У перыяд яго існавання ўзмацніўся феад. прыгнёт, што выклікала шматлікія сялянскія паўстанні. У выніку ўварвання (1398) войск Цімура і феад. мяцяжоў султанат распаўся. На яго тэр. ўтварыліся новыя дзяржавы. Найб. моцнай у І. ў 14—16 ст. была Віджаянагар. У 1565 ле перамагла кааліцыя войск мусульманскіх дзяржаў.

У 1498 у інд. порты ўвайшла партуг. эскадра на чале з Васка да Гама. Неўзабаве партугальцы захапілі марскі гандаль і пачалі занявольваць індыйцаў, насаджаць каталіцызм. Аднак іх улада абмяжоўвалася невялікімі прыбярэжнымі раёнамі і істотна не ўплывала на ўнутранае развіццё краіны. З 1519 правіцель Ферганы, заснавальнік дынастыі *Вялікіх Маголаў*, Бабур пачаў паходы ў І. і да 1527 пашырыў сваю ўладу на тэр. ад Кабула да Бенгаліі. Канчаткова ўлада Маголаў у Паўн. І. ўсталявалася, калі правіў падзішах Акбар [1556—1605]. Дзяржава распалася пры пераемніках Акбара (1-я пал. 18 ст.). У 17 ст. Партугалія страціла сваю перавагу ў Індыйскім ак. На тэрыторыі І. заснавалі свае факторыі Англія, Галандыя і Францыя. Барацьба (1746—63) паміж франц. і англ. Ост-Індскімі кампаніямі скончылася перамогай англічан. У 1757—65 англічане захапілі Бенгалію, пазней замацавалі свае пазіцыі ў Хайдарабадзе. У васальную залежнасць ад англ. Ост-Індскай кампаніі трапілі Ауд і Карнатык. У 1773 У І. ўстаноўлена пасада англ. генерал-губернатара. У 18 — 1-й пал. 19 ст. Вялікабрытанія вяла захопніцкія войны. Найб. вялікія з іх: англа-майсурскія (1767—99), англа-маратхскія (1795—1818), англа-сіхскія (1845—49) і інш., якія завяршылі англійскае калан. завалванне І. Да сярэдзіны 19 ст. ўлада Вялікабрытаніі ў І. ажыццяўлялася праз Ост-Індскую кампанію, якая была пад кантролем англ. ўрада. Калан. эксплуатацыя, грабеж абядняліі краіну. З 70-х г. 18 ст. адбываюцца паўстанні інд. сялян, рамеснікаў, выступленні феадалаў. У 20—30-я г. 19 ст. зараджаецца бурж.-нац. рух, узнікаюць першыя грамадска-паліт. арг-цыі, якія, пягледзячы на лаяльнасць у цэлым да калан. рэжыму, крытычна ставіліся да многіх яго бакоў. У 30—50-я г. 19 ст. ў Цэнтр. і Зах. І. адбыліся масавыя паўстанні сялян і рамеснікаў. Расла незадаволенасць часткі жыхароў і феад. памешчыкаў вялмельна-падатковай палітыкай англічан. Бязлітасны калан. прыгнёт — прычына магутнага *Індыйскага народнага паўстання 1857—59*, у якім удзельнічалі розныя колы інд. насельніцтва. Англ. ўлады расправіліся з паўстанцамі. Аднак урад метраполіі мусіў зрабіць захады, каб умацаваць сваю ўладу ў калоніі (ліквідацыя ў 1858 Ост-Індскай кампаніі, устанаўленне непасрэднай улады англ. кароны над І.).

Перарастанне ў Вялікабрытаніі капіталізму ў імперыялізм выклікала далейшае развіццё калан. эксплуатацыі І. Пачаўся вываз капіталу ў І. У краіне стаў развівацца капіталізм. Аднак рост нац. капіталу замаруджваўся ў выніку калан. палітыкі, панавання замежнага капіталу. Становішча краіны абцяжарвалі калан. войны, якія Вялікабрытанія вяла на паўн.-зах. і паўн.-ўсх. граніцах І. Выдаткі на гэтыя войны клаліся на плечы інд. працоўных. Незадаволенасць шырокіх колаў інд. насельніцтва палітыкай калан. улад вылівалася ў шматлікія паўстанні. З 70-х г. 19 ст. яны спалучаліся з першымі стачкамі інд. пралетарыяту, які тады пачаў фарміравацца, і бурж.-нац. рухам. Буржуазія дамагалася ад англічан эканам. і паліт. уступак. Узніклі мясцовыя бурж.-памешчыцкія арг-цыі, якія ў 1885 аб'ядналіся ў Індыйскі нацыянальны кангрэс (ІНК). На пачатак 20 ст. ў ім вызначыліся дзве плыні: ліберальная (адлюстроўвала інтарэсы буйной буржуазіі, вярхоў інтэлігенцыі, нацыяналістычна настроеных памешчыкаў) і радыкальная (прадстаўляла больш шырокія колы буржуазіі, сярэднія слаі). Лібералы былі за ўмераную апазіцыю калан. рэжыму і за захаванне англ. улады ў І. Радыкальныя нацыяналісты выступалі за прыцягненне нар. мас да арганізаванага нац.-вызв. руху і ў перспектыве — за заваёву нац. незалежнасці. У пач. 20 ст. ўзніклі невялікія нац.-рэвалюц. арг-цыі («тайныя т-вы»), якія ставілі мэту падрыхтаваць паўстанне супраць англ. улады, аднак дзейнічалі пераважна метадамі індывід. тэрору. Нац.-вызв. барацьба ўзмацнілася ў сувязі з падзелам Бенгаліі (1905) на мусульм. і індускую часткі і асабліва пад уплывам рускай рэвалюцыі 1905—07. У 1906 ІНК выступіў з патрабаваннем «самакіравання» І. ў межах Брытанскай імперыі. Упершыню адбыліся стачкі фабрычных рабочых і чыгуначнікаў. Англ. ўлады побач з рэпрэсіямі імкнуліся распаліць варожасць паміж мусульманамі і індусамі. У 1906 створана Мусульманская ліга, а таксама Вялікі саюз індусаў. Уздым масавага руху прымусіў Вялікабрытанію пайсці на некат. ўступкі маёмным класам (расшырэнне іх правоў у створаных у 1892 дарадчых органах, т. зв. заканадаўчых саветах; адмена ў 1911 закону пра падзел Бенгаліі).

У 1-ю сусв. вайну Вялікабрытанія выкарыстоўвала І. як базу для папаўнення сваёй арміі людзьмі і забеспячэння харчамі. Вайна яшчэ больш абвастрыла адносіны паміж калоніяй і метраполіяй, пагоршыла жыццё інд. працоўных. Пад уплывам Вял. Кастр. сацыяліст. рэв. ў 1918—20 баставалі рабочыя буйных прамысл. цэнтраў краіны. У 1920 узнік Усеіндыйскі кангрэс прафсаюзаў, у 1920—22 першыя камуніст. гурткі. У барацьбе супраць англ. панавання ўдзельнічалі розныя сац. групы і класы. ІНК з арганізацыі верхніх слаёў інд. буржуазіі, нац. настроеных памешчыкаў і найб. заможнай мясцовай інтэлігенцыі стаў ператварацца ў масавую партыю пад кіраўніцтвам нац. буржуазіі. Ідэйным правадыром ІНК пасля першай сусв. вайны стаў М. К. *Гандзі*. У змаганні супраць англічан ён імкнуўся аб'яднаць мусульман і індусаў, выступаў за масавыя дзеянні, аднак быў супраць насілля ў барацьбе. У снеж. 1920 сесія ІНК вырашыла пачаць кампанію грамадз. непаслушэнства (байкот англ. тавараў, спыненне работы ў англ. установах і г. д.). Пасля разгрому (1922—23) гал. цэнтраў барацьбы англ. ўлады яшчэ больш узмацнілі калан. прыгнёт, справака-

валі сутычкі паміж індусамі і мусульманамі, бязлітасна праследавалі камуністаў, асабліва пасля васнавання ў 1925 *Камуністычнай партыі Індыі* (КПІ). Сусв. эканам. крызіс 1929—33 выклікаў чарговы ўздым барацьбы інд. народа. На пач. 30-х г. у ІНК выдзелілася левае крыло на чале з Дж. *Нэру* і Ч. Босам. Яно аб'яднала прыхільнікаў актывізацыі антыімперыял. барацьбы. 26.1.1930 ІНК абвясціў новую кампанію грамадз. непаслушэнства. Аднак шырокі размах выступленняў працоўных напалохаў кансерватыўныя колы ў кіраўніцтве ІНК, і масавая кампанія была спынена. У 1934 абвешчана па-за законам КПІ. У 1935 англічане навязалі І. новую канстытуцыю, якая за антынар. характар атрымала назву рабскай. У перыяд новага пад'ёму нац.-вызв. барацьбы пачаў складвацца адзіны фронт антыімперыял. сіл, у якім актыўна ўдзельнічалі камуністы.

У вер. 1939 І. ўцягнута ў 2-ю сусв. вайну. Рэзка пагоршылася і без таго цяжкае становішча працоўных. Арэндная плата за зямлю павялічылася да 75% ураджаю, рэальная заработная плата працоўных зменшылася ўтрая. Нац. буржуазія выкарыстала спрыяльную ваен. кан'юнктуру, каб умацаваць свае пазіцыі, адначасова імкнулася да паліт. самастойнасці і незалежнасці краіны. Памешчыкі, князі, абшчынна-рэліг. партыі, наадварот, падтрымлівалі Вялікабрытанію. У гэтых умовах КПІ ставіла задачу выкарыстаць ваен. крызіс, каб заваяваць незалежнасць краіны. Пасля нападу фаш. Германіі на СССР ІНК у спец. рэзалюцыі выказаў спачуванне сав. народу, у 1942 вырашыў пачаць масавую кампанію супраць англ. улады, аднак кіраўніцтва партыі арыштавалі. У І. пачасціліся антыангл. забастоўкі і рабочыя дэманстрацыі, выступленні ў арміі. 18.2.1946 у Бамбейскім порце пачалося паўстанне ваен. маракоў. Рабочыя падтрымалі яго ўсеагульнай забастоўкай. Нарастала рэвалюц. сітуацыя. 24.8.1946 сфарміраваны часовы нац. ўрад на чале з Дж. Нэру. Справакаваныя англ. імперыялістамі ў сак. 1947 крывавыя індуска-мусульм. пагромы прымусілі ІНК згадзіцца з патрабаваннем Мусульманскай лігі: стварыць мусульм. краіну Пакістан. Падзел тэр. ажыццяўляўся па рэліг. прыналежнасці большасці насельніцтва, без уліку эканам., паліт. і геагр. асаблівасцей. 15.8.1947 І. абвешчана незалежнай. Яна атрымала статус дамініёна Брытанскай Садружнасці. Эканам. цяжкасці, звязаныя з шматгадовым панаваннем каланізатараў, паглыбіў ваен. канфлікт з Пакістанам, які пачаўся ў кастр. 1947 з-за Кашміра. Ён ускладняўся фінансавымі спрэчкамі. Ваен. дзеянні спыніліся толькі ў 1949, а адкрытая гандл. вайна ішла да 1950.

Паводле новай канстытуцыі (прынята ў ліст. 1949, набыла сілу 25.1.1950) І. абвешчана рэспублікай. Яе ўрад, нягледзячы на супраціўленне рэакцыі, узяў курс на стварэнне дзярж. сектара ў эканоміцы, стаў праводзіць палітыку недалучэння, устанавіў адносіны дружалюбнага супрацоўніцтва з СССР (дыпламатычныя адносіны з 1947) і іншымі сацыялістычнымі краінамі. На выбарах (канец 1951 — пач. 1952) у парламент і ў заканадаўчыя сходы штатаў перамог ІНК. Прыкметнага поспеху дамаглася КПІ. У 1951 прыняты 1-ы пяцігадовы план. У 1952—53 праведзена частковая агр. рэформа: адчужэнне за выкуп асн. зямель найб. буйных памешчыкаў. У лют. 1955 падпісана першае сав.-інд. пагадненне аб эканам. супрацоўніцтве. Рэакцыя выступіла супраць расшырэння дзярж. сектара. У барацьбе супраць дэмакр. сіл выкарыстала кіт.-інд. канфлікт 1962. У 1965 зноў абвастрыўся інд.-пакістанскі канфлікт з-за Кашміра, які перарос у ваен. дзеянні. Мірнаму вырашэнню канфлікту актыўна спрыяў Сав. Саюз (гл. *Ташкенцкая дэкларацыя 1966*). Дзейнасць рэакцыі асабліва актывізавалася пасля смерці ў 1964 Нэру, якога замяніў на пасадзе прэм'ер-міністра Л. Б. Шастры (п. у 1966). У студз. 1966 ва ўмовах вострай фракцыйнай барацьбы лідэрам ІНК выбрана дачка Дж. Нэру — І. *Гандзі*. Яе ўрад зрабіў захады, каб умацаваць дзярж. сектар (у 1970 у яго ўваходзіла больш за 80 буйных прадпрыемстваў). Аднак ва ўмовах т. зв. змешанай эканомікі ўмацавалі свае пазіцыі мясцовыя манаполіі. З 1964 да 1968 актывы 75 найбуйнейшых прамысл. кампаній павялічыліся з 26 да 40 млрд. рупій. Нявырашаным асталося агр. пытанне: ¾ сельскага нас. краіны беззямельныя ці малазямельныя. Абвастрылася класавая барацьба, паглыбіліся супярэчнасці паміж рознымі коламі буржуазіі. У 1968—70 адбыліся забастоўкі докераў, машынабудаўнікоў, рабочых джутавай прамысловасці, тэкстыльшчыкаў, гарнякоў. Беднякі-сяляне і с.-г. рабочыя занялі 500 тысяч акраў дзярж. і інш. зямель, незаконна прысвоеных буйнымі землеўладальнікамі. Абвастрэнне сац. супярэчнасцей і рост масавай барацьбы працоўных выклікалі крызіс у ІНК. Яго рэакц. крыло, т. зв. «Сіндыкат», у 1969 адкалолася ад партыі, стварыла «Арганізацыю кангрэс». У выніку ІНК страціў большасць у парламенце. Гэта дало рэакцыі магчымасць сарваць прыняцце законапраекта пра адмену феад. прывілеяў князёў, перашкаджаць ажыццяўленню ўсіх мерапрыемстваў, якія закраналі інтарэсы маёмных класаў. У адказ на наступленне правых сіл урад прыняў рашэнне распусціць Нар. палату. На датэрміновых выбарах (1—10.3.1971) перамог ІНК (350 месцаў з 518). Новы кабінет на чале з І. Гандзі абвясціў сваёй гал. мэтай ліквідацыю галечы ў краіне. У барацьбе супраць правай рэакцыі ўрад І. Гандзі падтрымалі прагрэс. сілы краіны, перш за ўсё камуністы. Урад стаў ажыццяўляць некат. прагрэс. мерапрыемствы па павелічэнні дзярж. сектара, абмежаванні манаполій. У 1971 пачалася нацыяналізацыя інд. і замежных прыватных кампаній агульнага страхавання. У сак. 1971 зноў абвастрыліся інда-пакістанскія адносіны. У выніку жорсткіх рэпрэсій урада Пакістана супраць насельніцтва ўсх. часткі краіны, якое выступіла за дэмакр. правы, па тэрыторыі І. апынулася каля 10 млн. усходнепакістанскіх бежанцаў, што стварыла для яе вялікія дадатковыя сац. і эканам. цяжкасці. Урад І. звярнуўся да ўрада Пакістана з заклікам спыніць рэпрэсіі і вырашыць праблему бежанцаў. Кіруючыя колы Пакістана 3.12.1971 пачалі ваен. дзеянні супраць І. Індыйскія ўзброеныя сілы з атрадамі ўсходнепакістанскіх патрыётаў далі рашучы адпор. Дзякуючы гэтаму, а таксама ў выніку заключанага ў 1971 Дагавору аб міры, дружбе і супрацоўніцтве паміж СССР і Рэспублікай І., накіраваны на ўмацаванне дружалюбных адносін паміж абедзвюма краінамі, міру ў Азіі і ва ўсім свеце. Значны ўклад у развіццё сав.-інд. эканам. і культ. сувязей робіць БССР. Яна пастаўляе І. аўтамабілі, трактары, станкі і інш. прамысл. абсталяванне. Бел. спецыялісты памагалі інд. рабочым асвоіць сав. машыны. Устанавіліся сувязі паміж Бел. т-вам дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі і Інда-сав. культ. т-вам. Падтрымліваюцца навук. кантакты паміж АН БССР і Інд. АН, паміж БДУ і ун-там у Хайдарабадзе. І. чл. ААН з 1945, сааўтар 5 прынцыпаў мірнага суіснавання (гл. *Панча шыла*), падтрымлівае дружалюбныя адносіны з сацыяліст. краінамі.

Дэманстрацыя жыхароў Калькуты супраць засілля ў краіне капіталістычных манаполій. 1970.





Сяляне на адной з фермаў, рэквізаванай у індыйскага манапаліста Бірла. 1970.

Аспоўныя палітычныя партыі, прафсаюзы і іншыя арганізацыі. Індыйскі нацыянальны кангрэс (ІНК). Кіруючая партыя. Засн. ў 1885. *Камуністычная партыя Індыі*. Засн. ў 1925, больш за 243 тыс. чл. (на ліп. 1970), старшыня Нац. савета КПІ Ш. А. Данге, ген. сакратар Ч. Р. Рао. Паралельная камуністычная партыя. Засн. ў 1964 групай кіруючых дзеячаў КПІ, якія трымаюцца лявацкіх поглядаў. Аб'яднаная сацыялістычная партыя. Створана ў 1964. Народна-сацыялістычная партыя (НСП). Засн. ў 1952. «Бхаратыя джан сангх» («Саюз інд. народа»). Нацыянал-шавіністычная партыя. Засн. ў 1951. «Арганізацыя кангрэс». Створана ў канцы 1969 у выніку расколу ІНК. Сватантра (Незалежная партыя). Крайне правая бурж.-памешчыцкая партыя. Засн. ў 1959. Акрамя названых, у асобных штатах існуюць свае паліт. партыі. Індыйскі нацыянальны кангрэс прафсаюзаў. Засн. ў 1947, больш за 2 млн. чал., уваходзіць у *Міжнародную канфедэрацыю свабодных прафсаюзаў* (МКСП). Усеіндыйскі кангрэс прафсаюзаў. Засн. ў 1920, 1,8 млн. чал., уваходзіць у *Сусветную федэрацыю прафсаюзаў*. Усеіндыйскі сялянскі саюз. Масавая дэмакр. арг-цыя. Нацыянальны камітэт салідарнасці краін Азіі і Афрыкі. Індыйска-савецкае культурнае таварыства.

Гаспадарка. І.— агр.-індустр. краіна. Мае багатыя прыродныя рэсурсы. Патэнцыяльныя запасы гідраэнергіі 30 млн. *квт*, кам. вугалю 130 млрд. *т*, баксітаў 250 млн. *т*. На долю І. прыпадае ⅘ сусв. здабычы слюды. І. займае 1-е месца ў капіталіст. свеце па зборы чаю, земляного арэха, рысу. Ад калан. часу атрымала ў спадчыну адсталую с. гасп. і слабаразвітую прамысловасць. У 1948—49 доля прамысловасці ў нац. даходзе складала 17%, с. гасп.— 49%. Пасля заваявання незалежнасці ўрад робіць захады для развіцця нац. эканомікі. У краіне ажыццяўляюцца сац.-эканам. пераўтварэнні. Праводзіцца агр. рэформа, накіраваная на ліквідацыю феад. адносін у с. гасп., на абмежаванне памераў памешчыцкага землеўладання, на ўстанаўленне пэўнай арэнднай платы, надзяленне малазямельных і беззямельных сялян і сельскагаспадарчых рабочых зямлёй, ствараюцца дзяржаўныя фермы, сельскагаспадарчыя кааператывы. Праведзена нацыяналізацыя чыгуначнага транспарту, прадпрыемстваў абароннай прамысловасці,

Нафтаперапрацоўчы завод у Бараўні, пабудаваны з дапамогай СССР.



прыватных фірмаў грамадз. авіяцыі, вялікіх банкаў. Новыя прадпрыемствы ў вугальнай, металургічнай, сталеліцейнай, авіяц., суднабуд. прамысловасці, а таксама тэлеграфнага і тэлефоннага абсталявання будуюцца ў межах дзярж. сектара. Стварэнне дзярж. сектара дало магчымасць планаваць развіццё эканомікі. Нац. даход у 1969 павялічыўся ў параўн. з 1947 у 2,3 раза і склаў 308 млрд. рупій. Вял. дапамогу ў развіцці эканомікі І. атрымлівае ад СССР і інш. сацыяліст. краін. З дапамогай СССР пабудавана і будуецца каля 70 прадпрыемстваў і аб'ектаў: металург. з-ды ў Бхілаі і Бакара, з-д цяжкага машынабудавання ў Ранчы, Анклешварскі нафтапромысел, эл. станцыя ў Нейвелі і інш. Значнае месца ў эканоміцы краіны займае замежны капітал (Вялікабрытанія, ЗША, ФРГ, Японія, Швейцарыя, Італія), найб. у нафтаапрацоўчай, хім. і электроннай прамысловасці. У 1965/66 і 1966/67 замежныя манаполіі вывезлі з І. 1,2 млрд. рупій прыбытку; замежныя інвестыцыі за гэты час склалі 742 млн. рупій.

Прамысловасць І. да 1947 мела калан. характар і была пад кантролем манаполій Вялікабрытаніі. Пераважала лёгкая і харч. прамысловасць. У гады 2-й сусв. вайны прыкметнае развіццё атрымала горназдабыўная і металургічная. Былі пабудаваны невялікія прадпрыемствы па зборцы аўтамабіляў, самалётаў і танкаў, па рамонце паравозаў. Ліквідацыя калан. рэжыму спрыяла развіццю эканомікі і стварэнню новых галін прамысловасці (машынабуд., хім., электратэхн., нафтаперапрацоўчай, атамнай і інш.). Пачала развівацца чорная і каляровая металургія. За 1947—67 прамысл. вытворчасць павялічылася ў 2,6 раза. У 1968 здабыта (тыс. *т*): кам. вуг. 70 814 (каля Джхарыя, Ранігандж); нафты 5773 (штаты Асам і Гуджарат); жал. руды 17 040 (штаты Біхар, Арыса, Майсур); марганцавай руды 634 (штат Арыса, Мадх'я-Прадэш). Здабываюцца слюда, уранавыя і хромавыя руды, магнезіт, баксіты, графіт, гіпс, сера. У 1969 выплаўка сталі ў параўн. з 1947 выросла ў 6,4 раза і склала 6500 тыс. *т*. Найб. значныя металург. з-ды ў Бхілаі, Асансоле, Дургапуры, Рауркела. У 1969 выплаўлена (тыс. *т*): медзі 9,5, свінцу 1,6, алюмінію 120,1 (Алвае, Хаўра, Ранігандж, Гхатсіла, Рыханд, Хіракуд і інш.). У 1968 выпрацавана эл. энергіі 51 400 млн. *кВт·гадз*, 41% даюць ГЭС. Пабудавана атамная эл. станцыя ў Тарапуры (штат Махараштра), будуюцца (1971) у Ранапратапсагары (Раджастхан) і Калпакаме. Станкабудаванне ў Бенгалуру, Ранчы, Чытаранджане; вытв. энергетычнага (у т. л. паравых турбін і турбагенератараў) і горнага абсталявання ў Бхопале, Лакхнаў, Рамачандрапураме, Дургапуры; машынабудаванне (вытворчасць аўтамабіляў, лакаматываў, трактароў, веласіпедаў) у Калькуце, Бамбеі, Бенгалуру, Чытаранджане, Джамшэдпуры; суднабудаванне ў Вісакхапатнаме, авіяц. з-д у Бенгалуру. Развіваецца хім. (вытворчасць мінер. угнаенняў у Сіндры, сернай к-ты, кальцынаванай і каўстычнай соды), цэментавая (у штатах Біхар, Тамілнад) і нафтавая. За гады незалежнасці магутнасць нафтаперапр. з-даў краіны выраслa з 0,3 млн. *т* да 17,6. Пры садзейнічанні СССР адкрыты нафтавыя радовішчы ў штаце Гуджарат, Рудрасагары, Дыгбой (Асам); пабудаваны нафтаачышчальныя з-ды ў штатах Біхар і Гуджарат, з дапамогаю Румыніі — у штаце Асам. Будуюцца нафтаперапр. з-ды ў Мадрасе, Халды, пабудаваны ў Бараўні, Гувахаты, Дыгбоі, Кочы і Мадрасе. Нягледзячы на хуткае развіццё галін цяжкай прамысловасці, пераважнае значэнне па кошце прадукцыі належыць тэкст. і харчовай. Найб. развіта баваўняная (2-е месца ў капіталіст. свеце пасля ЗША; 900 тыс. рабочых, 200 тыс. станкоў і 16 млн. верацёнаў) у Ахмадабадзе, Бамбеі, Дэлі, Калькуце, Канпуры і інш., джутавая (1-е месца ў свеце, 279 тыс. рабочых) у раёне Калькуты і шарсцяная. Развіваюцца харч., гарбарна-абутковая, тытунёвая, папяровая і шкляная прамысловасць. Саматужная вытворчасць маст. вырабаў з каляровых металаў, дрэва, слановай косці.

С. гасп. — галоўная галіна эканомікі, дае каля паловы нац. даходу І. У ёй занята каля 70% самадзейнага насельніцтва. Апрацоўваецца 163,7 млн. *га* зямлі (30 млн. *га* арашаецца), што складае каля 50% тэр. краіны. С. гасп. І. характэрныя перажыткі феадальных адносін і буйное памешчыцкае землеўладанне. Каля паловы ворных зямель сканцэнтравана ў руках буйных землеўладальнікаў, якія на кабальных умовах здаюць яе ў арэнду невял. ўчасткамі. 22% сялян зусім не маюць зямлі, 50% валодаюць участкамі да 0,4 *га*. У с. гасп. працуе 70 тыс. трактароў (1969), якія выконваюць 3,2% усіх с.-г. работ. Мала (каля 2 млн. *т* у 1968/69) выкарыстоўваецца мінер. угнаенняў. Збор і раёны вырошчвання гал. с.-г. культур (тыс. *т*, 1968): рыс 59 642 (Зах. Бенгалія, Біхар, Андхра-Прадэш, Тамілнад, Утар-Прадэш, усх. частка Мадх'я-Прадэш), на яго долю прыпадае каля паловы агульнага кошту с.-г. прадукцыі; пшаніца 16 540 (Пенджаб, Утар-Прадэш, Біхар, Махараштра, Андхра-Прадэш); кукуруза 5701 (Пн краіны); тэхнічныя: баваўнік (валакно) 1084, 3-е месца ў капіталіст. свеце (Махараштра, Гуджарат, Мадх'я-Прадэш, Майсур, Андхра-Прадэш, Тамілнад і Пенджаб); тытунь 368,7 (Зах. Бенгалія, Тамілнад, Андхра-Прадэш, Бамбей, Біхар); чай 402,7 (Асам, Зах. Бенгалія, Керала, Майсур); кава 58,3 (Майсур, Керала, Тамілнад); каўчуканосы (Керала). Прасяныя (джавар, баджра), бабовыя (грэм, тур і інш.) і алейныя (сезам, клешчавіна, гарчыца, рапс) пашыраны раўнамерна па ўсёй краіне. Вырошчваюць перац, кардамон, імбір, какосавыя пальмы (Малабарскі бераг), ананасы, бананы, манга. Па пагалоўі буйн. раг. жывёлы І. займае 1-е месца ў свеце, аднак прадукцыйнасць яе нізкая. Буйн. раг. жывёла (быкі, валы, буйвалы, зебу) выкарыстоўваюцца пераважна як цяглавая сіла. У 1968 было (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 176 100, свіней 4890, авечак 42 250, коней 1050, аслоў 1230. Гадуюць мулаў, вярблюдаў, птушак. Важнае значэнне

мае выкарыстанне лясных багаццяў. Каштоўны драўніна (ціка, сала, сандала), смолы, лакі часткова ідуць на экспарт.

Даўж. чыгунак 59,1 тыс. *км*, 58,4 тыс. *км* належаць дзяржаве, электрыфікавана 2,4 тыс. *км*. Па даўжыні чыгунак І. займае 3-е месца ў свеце. Аўтамаб. дарог 963 тыс. *км*, у т. л. 285 тыс. *км* з цвёрдым пакрыццём. Развіваецца авіятранспарт. Тры аэрапорты міжнар. значэння: Палам (Дэлі), Дум-Дум (Калькута), Сан-Крус (Бамбей). Развіваецца марскі транспарт. Гал. порты: Бамбей, Калькута, Мадрас, Вісакхапатнам, Кочы. Танаж гандл. флоту 2238 тыс. бр. рэг. *т* (1969). У 1969 (млрд. рупій) экспарт склаў 13,6, імпарт 18,6. Вывозіць І. джутавыя вырабы, чай, жал. руду, баваўняныя тканіны, чорныя металы, саматужна-мастацкія вырабы, скуры і скураныя вырабы; прывозіць прадукты харчавання, машыны і абсталяванне, штучныя ўгнаенні, чорныя і каляровыя металы. На долю сацыяліст. краін прыпадае 13,5% (1968) знешнегандлёвага абароту І. (10,4% імпарту і 18,9% экспарту). Асн. гандл. партнёры: ЗША, СССР, Вялікабрытанія, Японія, ФРГ; расшыраюцца гандл. сувязі з сацыяліст. краінамі. Грашовая адзінка — індыйская рупія.

Узброеныя сілы І. складаюцца з сухап. войск, ВПС і ВМС — каля 925 тыс. чал. (1970). Ёсць таксама пагранічныя войскі і сілы бяспекі (каля 100 тыс. чал.). Галоўнакамандуючы — прэзідэнт, непасрэднае кіраўніцтва ажыццяўляе міністр абароны. Тэр. краіны падзелена на 4 ваен. акругі. Сухап. войскі (каля 848 тыс. чал.): 23 пяхотныя і горнапяхотныя дывізіі, адна бранятанкавая дывізія, некалькі асобных часцей артылерыі, сувязі, інж. войск і інш. У складзе ВПС каля 57 тыс. чал. і каля 625 баявых самалётаў; у ВМС (больш як 20 тыс. чал.) 1 авіяносец, 2 крэйсеры, 7 эскадраных мінаносцаў і інш. баявыя і дапаможныя судны. У ваенна-марской авіяцыі больш за 60 самалётаў і верталётаў.

Ахова здароўя. Адзінай сістэмы аховы здароўя няма. Пераважае прыватнакапіталістычная з элементамі дзярж. і страхавой медыцыны. У 1969 было 12 418 бальнічных устаноў на 187 661 ложак (1 на 2200 ж.). У 1966 працавала 10 184 урачы (1 на 4830 ж.), 5673 стаматолагі, 74 567 фармацэўтаў, 88 582 мед. сястры і акушэркі. Рыхтуюць мед. кадры ў 81 мед., 31 зубаўрачэбным каледжы і 11 інш. навуч. установах. У 1961—65 нараджальнасць 41, агульная смяротнасць 17,2, натуральны прырост 23,8 на 1 тыс. ж. Пашыраны малярыя, туберкулёз, трахома, дызентэрыя, праказа, венерычныя і паразітарныя хваробы. І. эндэмічна на халеру, чуму, воспу.

Асвета. Кожны штат мае сваю школьную структуру. У 1918—30 у штатах прыняты законы аб абавязковым навучанні. Аднак напярэдадні абвяшчэння незалежнасці І. школы наведвала толькі каля 30% дзяцей ад 6 да 11 гадоў. Пасля 1947 урад І. робіць захады, каб ліквідаваць непісьменнасць у краіне, уведзена абавязковае пач. навучанне, адкрываюцца дзіцячыя сады і яслі для дзяцей працоўных, якія ствараюцца на сродкі штата; для дзяцей ад 5—6 да 11 гадоў). Навучанне бясплатнае, на роднай мове. У 1967/68 навуч. г. ў пач. школах займалася 64 030 тыс. дзяцей. У сярэдняй школе дзве ступені: першая — прамежкавая школа (з 11 да 14 гадоў), другая — старэйшая сярэдняя школа (з 14 да 17 гадоў). У старэйшай сярэдняй школе навучанне дыферэнцыраванае. Для тых, хто хоча паступіць у ВНУ, існуюць дадатковыя класы, дзе вучацца пасля заканчэння сярэдняй школы. У 1967/68 навуч. г. ў сярэдніх школах займалася 5820 тыс. чал. Прафесійныя школы на базе прамежкавай агульнаадук. школы. Побач з дзярж. школамі існуюць і прыватныя з навучаннем на англ. мове. У І. (1970) 83 ун-ты, найбольшыя з іх: Бамбейскі, Калькуцкі і Мадраскі. Б-кі: Нацыянальная (у Калькуце), публічная (у Дэлі). Музеі: Нац. ў Нью-Дэлі, Індыйскі ў Калькуце.

Навуковыя ўстановы. Навук. т-вы: с.-г. і вет. навук; мастацтваў; бібліяграфіі і бібліятэчных навук; эканомікі, закону і палітыкі; адукацыі; гісторыі, геаграфіі і археалогіі; мовы і л-ры; медыцыны; прыродазнаўчых навук (акадэміі: Індыйская, Нац., Раджастханская і інш.); рэлігіі, сацыялогіі і антрапалогіі; тэхналогіі. НДІ: савет па навук. і індустр. даследаванні, аб'яднуе 35 нац. даследных лабараторый; с.-г. і вет. навук (аграэканоміка, засушлівая зона, унутр. рыбалоўства, рыс, тытунь, лес, с. гасп., ветэрынарыя, марская біялогія, малако, цукар, гума і інш.); мастацтваў (у т. л. Акадэмія мастацтва, культуры і моў); эканомікі, закону і палітыкі; адукацыі; гісторыі, геаграфіі і археалогіі; мовы і л-ры; медыцыны; прыродазнаўчых навук (агульныя, біял. навук, матэматыкі, фіз. навук, у т. л. некалькі абсерваторый); філасофіі і псіхалогіі (у т. л. Ін-т іогаў); рэлігіі, сацыялогіі і антрапалогіі; тэхналогіі і інш.

Друк, радыё, тэлебачанне. У І. выходзіць 11 678 перыядычных выданняў, у т. л. больш за 500 штодзённых і каля 7 тыс. штотыднёвых і інш. газет. Найб. масавыя: «Amrita Bazar Patrika», на англ. мове, незалежная, падтрымлівае ІНК; «Ананда базар патрыка», на мове бенгалі, газета калькуцкіх манапалістаў; «Джугантар» («Новая эпоха»), на мове бенгалі, падтрымлівае ІНК; «Current» («Цяперашнія падзеі»), на англ. мове, крайне правага кірунку; «Нау бхарат таймс» («Час новай Індыі»), на мове хіндзі, трымаецца кірунку ІНК; «New Age» («Новы век»), орган Нац. Савета КПІ; «National Herald» («Нац. веснік»), на англ. мове, заснаваны Дж. Нэру, падтрымлівае ІНК; «Organiser» («Арганізатар»), на англ. мове, орган партыі «Бхаратыя джан сангх»; «Patriot» («Патрыёт»), на англ. мове, орган прагрэс. грамадскасці; «Swarajya» («Самакіраванне»), на англ. мове, орган партыі Сватантра; «Statesman» («Дзяржаўны дзеяч»), на англ. мове, выразніца інтарэсаў англ. і інд. манапалій; «Times of India» («Часы Індыі»), на англ. мове, цесна звязана з правымі коламі і інд. буржуазіяй; «Hindu» («Індус»), на англ. мове, блізкая да ІНК; «Хіндустан» («Індыя»), на мове хіндзі, блізкая да ІНК; «Hindustan Times» («Інд. часы»), на англ. мове, належыць манапаліст. канцэрну Бірла, выступае з крытыкай урада. Часопісы: «Blitz» («Маланка»), «Link» («Звяно»), на англ. мове, прагрэс. штотыднёвікі. Агенцтва Press Trust of India — PTI, акцыянернае т-ва ўладальнікаў інд. газет, распаўсюджвае ўнутраную і міжнар. інфармацыю. Працуе некалькі прыватных агенцтваў. Усеіндыйскае радыё, урадавая служба, кантралюецца міністэрствам інфармацыі; Усеіндыйскае радыё-тэлебачанне, урадавая служба.

Літаратура. Найб. стараж. помнікі напісаны ў канцы 2-га тысячагоддзя да н. э. на ведычным санскрыце (свяшчэнная кніга індуізму «Рыгведа» і інш.). У 5 ст. да н. э. створаны інд. нар. эпапеі «Махабхарата» і «Рамаяна». У сярэдзіне 1-га тысячагоддзя да н. э. будыйскія і джайніскія прававеднікі пачалі пісаць на сярэднеінд. мовах — палі і пракрытах. У 4—6 ст. дасягнулі росквіту драма, эпас, лірыка на санскрыце і старажытнатамільская л-ра, якая ўзнікла ў 4—3 ст. да н. э. У канцы 1-га — пач. 2-га тысячагоддзя зарадзілася л-ра на інш. жывых мовах — дравідыйскіх (канада, малаялам, тэлугу) і новаіндаарыйскіх (бенгальская, гуджарацкая, маратхская і інш.). Уварванне ў І. войск краін Сярэдняга Усходу, пашырэнне ісламу выклікалі станаўленне інд. персамоўнай л-ры. У 15—17 ст. гандл.-рамесніцкая і сялянская анаўляцыя феадалізму спрыяла росквіту л-ры, накіраванай супраць класавага, каставага і рэліг. уціску. Калан. заняволенне І. ў 18 ст. абумовіла заняпад л-ры. У 1-й чвэрці 19 ст. ўзнікла англамоўная л-ра І.

Большасць інд. л-р у 2-й пал. 19 ст. мела асветніцкі характар. Станоўчы ўплыў на развіццё л-ры І. мела нар. паўстанне 1857—59. З 20-х г. 20 ст. асн. тэма — барацьба за нац. незалежнасць. У сярэдзіне 30-х г. зарадзіўся рух прагрэс. пісьменнікаў І., ідэйна-эстэт. платформа яго — дэмакратызацыя л-ры, набліжэнне яе да жыцця; узмацнілася нац. кансалідацыя л-ры; сфарміравалася рэвалюц.-дэмакр. плынь; умацаваліся пазіцыі крытычнага рэалізму. Вяршыня развіцця крытычнага рэалізму

ў інд. л-ры — творчасць Р. *Тагора* і *Прэмчанда*. Пісьменнікі (раманіст і драматург У. Ашк і інш.) стварылі вобразы людзей, якія расчараваліся ў ідэі бурж. прадпрыемніцтва і парываюць з сваім класам. Пад уплывам савецкай і рэвалюц. сусв. л-ры адбывалася станаўленне сацыяліст. рэалізму ў л-ры І. (паліт. паэзія і інтымная лірыка паэта урду Вафы, раманы бенгальскага пісьменніка Гопала Халдара, проза і публіцыстыка пісьменніка хіндзі Яшпала). Творчасць паэта М. Ікбала, які пісаў на урду і фарсі, завяршыла гісторыю персамоўнай л-ры І. Інд. раман напоўніўся грамадскім і паліт. зместам, інтэнсіўна развівалася навела, узнік жанр кароткага верша. Як правабурж. рэакцыя на нац.-вызв. рух у 20—30-я г. паявіліся мадэрнісцкія тэндэнцыі і кірункі, у паэзіі ўпадніцкія матывы набылі містычную афарбоўку (паэтэса хіндзі Махадэві Варма). Складаны характар ідэйна-маст. барацьбы абумовіў зварот шэрагу прагрэс. пісьменнікаў да дэкадэнцкіх формаў (сімвалісцкія драмы Тагора, пісьменнікаў хіндзі Дж. Прасада, С. Панта), але рэальны змест іх твораў выходзіць за межы ідэйна-эстэт. прынцыпаў упадніцкіх плыняў. Заваяванне незалежнасці (1947) спрыяла росту прагрэс. л-ры, паставіла на першы план сац. тэматыку, умацавала адзінства л-р І., захоўваючы нац. самабытнасць кожнай. Рэзка абвастрыліся прынцыповыя разыходжанні паміж прагрэс. і рэакц. кірункамі. Асн. тэма — трагедыя чалавека ў капіталіст. свеце. Сярод крытычных рэалістаў вырасла цікавасць да людзей працы, барацьбітоў з сац. несправядлівасцю. У творчасці шэрагу пісьменнікаў паяўляюцца «сучасныя» дробнабурж. утопіі (напр., у рамане пісьменніка хіндзі Амрытлала Нагара «Нектар і атрута» гучыць заклік да дробнай буржуазіі аб'яднаць свае капіталы, каб стаць незалежнымі ад уціску манапалістаў). «Правінцыяльны раман» пра асобныя раёны Паўн. І. пашырыў межы л-ры хіндзі, якая паступова выходзіць на першае месца. Л-ра бурж. рэакцыі абнавіла формы і метады ідэйна-маст. ўздзеяння. Паяўляюцца творы, накіраваныя супраць камуніст. руху. Да лагера рэакцыі далучаюцца пісьменнікі т. зв. рэліг. кірунку.

На бел. мове асобнымі выданнямі выйшлі: зб. інд. нар. казак «Чароўная чаша» (апр. Н. Ходзы, 1957), зб. апавяданняў інд. пісьменнікаў «Дрэва вады» (1959), «Выбранае» (1957) К. Чандра, раманы Тагора «Садоўнік» (1927) і «Крушэнне» (1958). У перыёдыцы БССР друкаваліся на бел. мове паасобныя творы Тагора, Прэмчанда, Н. М. Валатхола, Х. Чатападхаі, М. Р. Ананда і інш. інд. пісьменнікаў.

Архітэктура. Стараж. архітэктура І.— абарончыя, гасп., жылыя пабудовы г. Махенджа-Дара і Харапа (3—2-е тысячагоддзі да н. э.). Формы і тыпы нар. архітэктуры 2 — сярэдзіны 1-га тысячагоддзяў да н. э. ляглі ў аснову дойлідства наступных эпох; у гэты час складваюцца правілы забудовы і геам. планіроўкі вёсак і гарадоў. У дзяржаве Маур'яў (4—2 ст. да н. э.) ствараюцца багатыя жылыя дамы і палацы, будыйскія культавыя збудаванні: мемарыяльныя стаўпы («стамбха» ў Сарнатху), манумент. паўсферычныя пабудовы («ступа» ў Санчы), пячорныя храмы («чайцья») у Кондане, *Аджанце*, Карлі, манастыры. Узнікаюць новыя арх. рашэнні (вежападобны храм Махабодхі ў Будх-Гаі, храм у Санчы, 5 ст.). З 6—7 ст. храмы стараж. тыпаў (скальны храм у Элоры, 8 ст.) саступаюць месца на Пн вежападобным акруглым будынкам (у Бхубанесвары, Кхаджураха, 10—12 ст.), а на Пд храмам у выглядзе ўсечаных пірамід (у Махабаліпураме, 7 ст.), з канцэнтрычнымі агароджамі і надваротнымі вежамі (у Танджавуры, пач. ў 11 ст.). Ім уласцівыя багацце пластычных чляненняў, плаўны пераход арх. формаў у скульптурныя. З 13 ст. ў Дэлійскім султанаце архітэктура набывае геам. дакладнасць, пашыраюцца стральчатыя аркі, плоскасная паліхромная арнаментацыя, будуюцца мячэці, кўпальныя пахавальні, мінарэты (Кутб-Мінар у Дэлі, каля 1200). Яна дасягнула росквіту ў дзяржаве Вялікіх Маголаў у 16—17 ст.: умацаванні і мармуровыя палацы Агры і Дэлі, мячэці, маўзалей Тадж-Махал каля Агры. На Пд па-ранейшаму будавалі аздобленыя скульптурай храмы (у Мадураі, 17 ст.), у Раджастхане стваралі палацы-крэпасці, «вежы перамогі». Раслі гарады з мураванымі дамамі. Каланізатары ў 19 — пач. 20 ст. ўкараняюць эклектычныя формы архітэктуры. Гарады (Бамбей, Калькута, Дэлі) забудоўваюцца дамамі еўрап. тыпу, узнікаюць рэзкія кантрасты раёнаў стараж. архітэктуры, багатых еўрапеізаваных кварталаў і трушчобнага жылля беднаты. З усталяваннем незалежнасці І. будуюцца новыя гарады (Нілакхеры, Гандыдама, Новы Бхубанесвар, Чандыгарх і інш.). У прамысл. буд-ве Індыі памагае Сав. Саюз (металург. камбінат у Бхілаі і інш.). У вял. гарадах будуюцца грамадскія і жылыя дамы з улікам дасягненняў сучаснай сусветнай архітэктуры. У невялікіх гарадах у будаўніцтве захоўваюцца традыцыі мясцовага народнага дойлідства. Іл. гл. на ўклейцы.



Галава Буды з Гандхары. Вапняк. Каля 3—5 ст. Музей Вікторыі і Альберта. Лондан.

Выяўленчае мастацтва. Найб. старадаўнія помнікі зберагліся з 3—2-га тысячагоддзяў да н. э. (скульптура і кераміка з Махенджа-Дара і Харапы). Высокага ўзроўню дасягнула мастацтва ў перыяд дзяржавы Маур'яў (4—2 ст. да н. э.). У статуях багінь урадлівасці («якшыні»), у пластычнай сакавітасці скульптурнага ўбрання храмаў, агароджы «ступа» ў Санчы (1 ст. да н. э.) увасобіліся ўяўленні пра паўнакроўныя сілы абагаўлёнай прыроды. У спалучэнні з эліністычнымі матывамі гэтыя ўяўленні далі ў т. зв. гандхарскім мастацтве (1—4 ст.) гарманічна ясныя вобразы будыйскіх багоў. У маст. культуры дзяржавы Гуптаў (4—5 ст.) узніклі строгія ідэалізаваныя вобразы (статуя Буды з Сарнатха), наскальныя рэльефы (у Удаягіры), пышная скульптура пячорных храмаў Аджанты, найбольш вядомых роспісамі, якія спалучаюць узвышаную адухоўленасць з праслаўленнем пачуццёвай прыгажосці чалавека і прыроды. З 6—7 ст. у І. развіваецца адцягненая рэліг. сімволіка (бюст Шывы з трыма тварамі ў храме ў Элефанце, 8 ст.). У Дэлійскім султанаце (13 ст.) і ў імперыі Вялікіх Маголаў найбольш развіваюцца арнамент. мастацтва, мініяцюра. У перыяд калан. прыгнёту, які амаль поўнасцю паралізаваў творчую ініцыятыву і маст. актыўнасць індыйцаў, мастацтва І. развівалі пераважна нар. майстры, якія данеслі свае традыцыі да сучаснасці (мініяцюрысты ў Раджастхане, майстры разьбы па косці і дрэве ў Майсуры, Керала, разьбы па камені ў Агры, майстры вырабаў з металу ў Бідары, Хайдарабадзе, з эмалі ў Раджастхане, ткачы ў Бенарэсе, Кашміры). Станковае мастацтва пачало развівацца з 2-й пал. 19 ст. Да сац. тэм, да прыроды звярнуліся мастакі 19—20 ст., якія ўспрынялі вопыт еўрап. рэаліст. мастацтва — Р. Варма, Д. П. Гангулі, С. Л. Халданкар. Вял. ўклад у развіццё новага мастацтва І. зрабіла плынь «бенгальскага рэнесансу» (канец 19—30-я г. 20 ст.; мастакі А. Тагор, Н. Бос, С. Укіл, Б. Укіл). З абвяшчэннем незалежнасці І. пачаўся перыяд уздыму мастацтва. У вобразах, блізкіх да бенгальскага лубка, праслаўляюць жыццё Дж. Рой, Д. П. Рой Чаўдхуры, Б. Н. Джыджа, С. Н. Банерджы, А. Мукхерджы. Сцэны працы піша К. К. Хебар, у алейным жывапісе працуюць А. Шэр-Гіл, А. Бос, у гравюры — Х. Дас, у скульптуры — В. П. Кармаркар, Б. В. Талім, К. Сен і інш. На мяжы 50—60-х г. 20 ст. пашырыліся фармаліст. плыні, узмацнілася барацьба з імі рэаліст. кірунку. Развіваюцца традыц. віды нар. маст. промыслаў (разьба па дрэве, косці, выраб і чаканка метал. посуду і зброі, ткацтва, інкрустацыя, кераміка). Іл. гл. таксама на ўкл.

Музыка. Народы І.— носьбіты найстаражытнейшай самабытнай муз. культуры. Трактат па т-ры, музыцы і танцы «Нацьяшастра» (1—2 ст. н. э.) дае падставы лічыць, што ўжо да таго часу ў індыйцаў была высокаразвітая муз. сістэма. Інд. муз. творчасць пераважна аднагалосая, з 7-ступеннымі ладамі, якія дапускаюць храматычныя змены

(характэрна наяўнасць інтэрвалаў, меншых за паўтон). Яна заснавана на прынцыпе імправізацыі. Кожны інстр. і вак. твор мае ў аснове традыц. ладава-рытмічныя ўтварэнні — рагі (адно з асн. паняццяў інд. муз. эстэтыкі), якім прыпісваецца пэўнае псіхал. і этычнае ўздзеянне. У класічнай вак. музыцы І. мноства стыляў. Адзін з найб. яркіх элементаў інд. муз. творчасці — рытм. Складанасць рытмікі шмат у чым тлумачыцца арганічнай сувяззю музыкі з нац. танцам, якая нараджае арыгінальныя, спецыфічныя інд. маст. формы. Асн. нац. інструменты: віна, сітар, тамбура (шчыпковыя), раванастр, сарангі, сарында (смыковыя), табла, банія (ударныя). Нягледзячы на тое, што прафес. музыка мае вытокі ў фальклоры, жанры нар. і класічнай музыкі істотна адрозніваюцца. Нар. песні розных народаў І. надзелены лакальнымі асаблівасцямі, ім уласцівыя натуральнасць мелодыкі, яркая сац. акрэсленасць. З пач. 20 ст. пад уплывам нац.-вызв. барацьбы сярод інд. музыкантаў расце ўвага да нац. муз. спадчыны. Гэты рух непасрэдна звязаны з творчасцю выдатнага пісьменніка і музыканта Р. Тагора і мае прыхільнікаў да нашых дзён. Пасля абвяшчэння незалежнасці І. ўрад здзейсніў шэраг мерапрыемстваў, накіраваных на адраджэнне муз. культуры. Створаны Акадэмія музыкі, танца і драмы (1953), нац. аркестр (1952), сетка навуч. устаноў. На развіццё інд. музыкі дабратворна ўплывае нац. кінамастацтва. Сярод сучасных музыкантаў І.: кампазітары А. Бісвас, Ш. Чаўдхуры, кампазітар і віртуоз на сітары Р. Шанкар, дырыжор З. Мета.

Тэатр. Вытокі тэатр. паказаў у разнастайных абрадах, гульнях і танцах інд. плямёнаў. Стараж. паданні, паэмы «Рамаяна» і «Махабхарата» ляжаць у аснове нар. паказаў. Папулярныя формы нар. відовішчаў Пн І.— лілы, рамлілы і крышналілы. У Зах. Бенгаліі і Арысе пашыраны муз.-танц. паказы джатра. На Пд І.— катхакалі і якшагана. Акцёры катхакалі карысталіся распрацаванай сістэмай жэстаў (мудра), складаным грымам і касцюмам. Розныя формы нар. т-ра існавалі ў інш. частках І.: тамаша (Махараштра), джашы (Кашмір), свангі (Раджастхан) і г. д. Нар. паказы ўплывалі на фарміраванне класічнага т-ра і драмы, росквіт якіх звязаны з творчасцю Бхасы (2—3 ст.), Калідасы (4 ст.), Шудракі (5 ст.). У 5—7 ст. класічны т-р занепадае, у 11—12 ст. фактычна знікае. У 2-й пал. 19 ст. з ростам нац.-вызв. руху ўзнік





Сцэна з паказу катхакалі «Перамога Балі» (злева). Танец катхак. 20 ст.

т-р еўрап. тыпу на новаінд. мове. У 40-я г. 20 ст. тэатр. жыццё актывізуецца. Паяўляюцца тэатр. прафес. і аматарскія калектывы, якія заклікаюць да барацьбы за незалежнасць. У 1943 Асацыяцыя нар. т-раў аб'яднала прагрэс. тэатр. калектывы, стварыла трупу «Малады балет» (1952, кіраўнік Ш. Бардхан). Пасля 1947 адбываецца адраджэнне культуры І. Заснавана Акадэмія музыкі, танца і драмы («Сангіт натак акадэмі», 1953), дзярж. тэатр. школа ў Дэлі (1959). У 60-я г. ў І. працавала больш за 30 прафес. тэатр. калектываў: пастаянныя т-ры ў Калькуце, Катацы (Арысе), Мадрасе, Бамбеі, Бенарэсе, Пуне.

Кіно. Кінавытворчасць у І. пачалася з 1913. Экспансія зах.-еўрап. і асабліва амер. кіно тармазіла развіццё інд. кінематаграфіі. Выпускаліся пераважна фільмы на міфалаг. сюжэты, меладрамы і псеўдагістарычныя стужкі. З 2-й пал. 40-х г. ствараецца незалежная нац. кінематаграфія. Значныя фільмы: «Не чакалі» і «Суседзі» (1936, 1939, рэж. В. Шантарам), «Дзеці зямлі» і «Спадарожнік» (1946, 1953, Х. А. Абас), «Абяздоленыя» (1949, Н. Гхош), «Бадзяга» (1951, Р. Капур), «Два бігхі зямлі» (1953, Б. Рой), «Песня дарогі» і «Непераможныя» (1955, 1957, С. Рэй). Папулярныя муз. фільмы, часта на гістар. сюжэты. Выпускаецца больш як 350 фільмаў за год.

Літ.: Маркс К. Хронологические выписки по истории Индии, [М.], 1947; Маркс К. и Энгельс Ф. О национально-освободительном восстании 1857—1859 гг. в Индии. Сб., М., 1959; Ленін У. І. Гаручы матэрыял у сусветнай палітыцы, Тв., т. 15 (Полн. собр. соч., т. 17); Бонгард-Леви Г. М. и Ильин Г. Ф. Древняя Индия. Исторический очерк, М., 1969; История Индии в средние века, М., 1968; Новая история Индии, М., 1961; Новейшая история Индии, М., 1959; Райков А. В. Пробуждение Индии, М., 1968; Семенов Е. К. Сотрудничество во имя прогресса. (Страны социализма и индустриализации Индии), М., 1968; Александров М. А. Экономическая экспансия США в Индии, М., 1963; Идеологические проблемы современной Индии, М., 1970; Никитин А. Хождение за три моря Афанасия Никитина, М., 1960; Данге С. А. Индия от первобытного коммунизма до разложения рабовладельческого строя, пер. с англ., М., 1950; Неру Дж. Открытие Индии, пер. с англ., М., 1955; яго ж. Внешняя политика Индии. Избр. речи и выступления, пер. с англ., М., 1965; Датт Р. П. Индия сегодня, пер. с англ., М., 1948; гл. таксама літ. да арт. *Індыйскае народнае паўстанне 1857—59*; Рябчиков А. М. Природа Индии, М., 1950 (Записки Всесоюзного геогр. об-ва. Новая сер., т. 12); Баталов А., Княжинская Л. и Сдасюк Г. Южная Индия. Экономико-географическая характеристика, М., 1966; Проблемы экономического и социального развития независимой Индии, М., 1967; Литературы Индии, М., 1958; Поэзия народов Индии, М., 1962; Современная индийская проза, М., 1962; Рабинович И. С. Сорок веков индийской литературы, М., 1969; Культура современной Индии, М., 1966; Литература Древнего Востока, М., 1962; Литература Востока в средние века, ч. 1, М., 1970; История индийских литератур, пер. с англ., М., 1964; Всеобщая история искусств, т. 1, М., 1956; Искусство стран и народов мира, т. 2, М., 1965; Тюляев С. И. Искусство Индии, М., 1968; яго ж. Архитектура Индии, М., 1939; Прокофьев О. Искусство Индии, М., 1964; Короцкая А. Сокровища индийского искусства, М., 1966; Искусство Индии, М., 1969; Музыка народов Азии и Африки, М., 1969, с. 250—259; Драматургия и театр Индии. Сб. ст., М., 1961; Бабкина М. П. и Потабенко С. И. Народный театр Индии, М., 1964; Гарги Б. Театр и танец Индии, пер. с англ., М., 1963; Колодяжная В. С. Кино Индии, М., 1959.

В. А. Дзяменцьеў (прырода), *Ф. С. Фешчанка* (гаспадарка), *Р. М. Трухноў* (гістар. нарыс), *Дз. П. Бяляцкі* (ахова здароўя). Мінск; *З. К. Навокіна* (асвета), *І. С. Рабіновіч* (літаратура), *М. П. Бабкіна* (музыка, тэатр). Масква.

ІНДЫЯНА (Indiana), штат на Пн ЗША, паміж воз. Мічыган і р. Агайо. Пл. 94,1 тыс. *км²*. Нас. 5143 тыс. чал. (1970). Адм. ц. Індыянапаліс. Найб. гарады: Эвансвіл, Форт-Уэйн, Гэры, Саўт-Бенд. Паверхня — узгорыстая раўніна з шырокімі рачнымі далінамі на ПнУ і больш роўнай часткай на ПдЗ. Глебы чарназёмныя. Радовішчы кам. вуг., нафты, газу, буд. матэрыялаў. Клімат умерана кантынентальны. Лясы амаль поўнасцю высечаны. Найб. рэкі: Агайо, Уобаш. І.— індустр.-агр. штат. У прамысловасці занята каля 730 тыс. чал. (1970). Металургічная (3-е месца ў ЗША па выпл.

чыгуну і сталі), маш.-буд. (у т. л. аўта-, авія-, с.-г., станкабудаванне), эл.-тэхн., металаапр., хім. (у т. л. нафтаперапр.), гумавая, палігр., фармацэўтычная, мэблевая, харчовая (у т. л. мясаканцервавая, мукамольная) прамысловасць. Вырошчваюць кукурузу ($^1/_2$ кошту прадукцыі паляводства), пшаніцу, авёс, сою, тытунь. Гадуюць буйн. раг. жывёлу, свіней, авечак. Транспарт чыг., аўтамабільны. Суднаходства па р. Агайо і ніжнім цячэнні р. Уобаш.

ІНДЫЯНАПАЛІС (Indianapolis), горад на Пн ЗША. Адм. ц. штата Індыяна. Вузел чыг. і аўтамаб. дарог. Аэрапорт. 742,6 тыс. ж. (1970). Машынабудаванне (у т. л. с.-г., вытв. рухавікоў для аўтамабіляў); авіяц.-ракетная, эл.-тэхн. (у т. л. вытв. тэлевізараў, тэлефоннай апаратуры), металаапр., хім., фармацэўтычная, харч. (у т. л. мукамольная, мясная, кансервавая), шкляная, гумавая, паліграф. прамысловасць. Ун-т (з 1850).

ІНДЭКС у статыстыцы (лац. index паказчык), адносны паказчык, які характарызуе змены складаных эканам. з'яў ці суадносіны іх у прасторы. Выражае адносіны велічыні (узроўню) пэўнай з'явы ў дадзены (бягучы ці справаздачны) перыяд да велічыні той жа з'явы ў перыядзе, з якім параўноўваецца (базісны перыяд, ці база І.). Характарызуе развіццё эканомікі нар. гаспадаркі. З дапамогай І. вызначаецца ўплыў розных фактараў на дзейнасць прадпрыемстваў і арг-цый, вывучаюцца сувязі і залежнасці паміж рознымі эканам. з'явамі.

Па характары эканам. з'яў, якія вывучаюцца, І. падзяляюцца на індывідуальныя і агульныя (зведзеныя). Індывідуальныя паказваюць змены простай, адзінкавай з'явы. Калі сабекошт адзінкі прадукцыі ў справаздачным перыядзе z_1, у базісным — z_0, то індывідуальны І. змены яе сабекошту — $i = \frac{z_1}{z_0}$. Агульныя паказваюць змены складаных эканам. з'яў, якія складаюцца з непасрэдна несувымерных элементаў. Агульны І. сабекошту прамысл. прадукцыі вылічваецца па формуле $I = \frac{\Sigma g_1 z_1}{\Sigma g_1 z_0}$ (g_1 — колькасць адзінак прадукцыі кожнага віду за справаздачны перыяд). Агульныя І. ў залежнасці ад звестак пра велічыню, якая індэксуецца (г. зн. той прыкметы, змена якой вывучаецца), бываюць агрэгатныя, сярэдніх арыфметычных і сярэдніх гарманічных. Агрэгатная форма І.— асноўная, выходная; найбольш поўна выражае ўзаемасувязь эканам. з'яў. Агрэгатны І. паказвае змену аб'ёму пэўнай эканам. з'явы пад уплывам змены аднаго фактара пры нязменнасці іншых. Розніцу лічніка і назоўніка агрэгатнага І. ($\Sigma g_1 z_1 - \Sigma g_1 z_0$) выражае змену сумы выдаткаў на вытворчасць (эканомія ці перарасход). Калі за выходныя звесткі бяруцца І. асобных элементаў складанай эканам. з'явы, то агульныя І. вылічваюцца па формуле сярэдняга арыфметычнага і сярэдняга гарманічнага І. У статыстыцы вылічваюцца І. пераменнага і фіксаванага саставу. У планавай і стат. рабоце вылічваюцца сярэднія І. цаны, заработнай платы, ураджайнасці і г. д., на велічыні якіх адбіваюцца і змены структурных зрухаў. Па характары велічынь, якія індэксуюцца, бываюць: І. заработнай платы, І. прадукцыйнасці працы і г. д. Адрозніваюць І. з пастаяннай базай параўнання, ці базісныя (пры вылічэнні звесткі ўсіх перыядаў параўноўваюць з адным перыядам, узятым за базу), і І. з пераменнай базай параўнання, ці ланцуговыя (звесткі кожнага перыяду параўноўваюць з дадзенымі папярэдняга перыяду).

У сав. статыстыцы пры вылічэнні І. папярэдне вызначаецца сутнасць з'явы, якая вывучаецца, яе ўзаемадзеянне з інш. эканам. з'явамі. Бурж. статыстыкі пры пабудове формулы агульных І. адрываюць матэм. афармленне І. ад яго эканам. зместу, чым скажаюць звесткі пра цэны і ўзровень жыцця, заніжаюць прыбыткі капіталістаў.

Літ.: Ленин В. И. Письмо П. И. Попову и поручение секретарю. 1.9.1921, Полн. собр. соч., т. 53; Казинец Л. С. Теория индексов, М., 1963; Перегудов В. Н. Теоретические вопросы индексного анализа, М., 1960; Черменский В. Д. Индексы буржуазной статистики на службе капитала, М., 1954; Югенбург С. М. Индексный метод в советской статистике, М., 1958.

Н. К. Матвеенцава. Мінск.

ІНДЭКС ЗАБАРОНЕНЫХ КНІГ (лац. Index librorum prohibitorum), спіс кніг, якія каталіцкая царква забараняе чытаць веруючым.

Першы спіс забароненых кніг надрукаваны ў 1559 пры папе Паўле IV. Потым у яго рэгулярна ўносіліся лепшыя творы чалавечай думкі (тв. Б. Спінозы, Вальтэра, Дж. Бруна, Р. Дэкарта, І. Канта, Г. Гейнэ, А. Франса і інш.). У апошнім выданні (1948) змяшчаў калля 8 тыс. назваў кніг. З 1966 вядзенне І. з. к. у ранейшай форме спынена. Чатыры стагоддзі І. з. к. у руках каталіцкай царквы быў адным са сродкаў барацьбы супраць перадавой навукі і прагрэсу.

ІНДЭПЕНДЭНТЫ (англ. independent незалежны), прадстаўнікі рэлігійна-царкоўнай плыні, аднаго з кірункаў *пратэстантызму*; у англ. бурж. рэвалюцыю 17 ст. паліт. партыя.

Рэліг.-царк. плынь І. аформілася ў канцы 16 ст.; левае крыло англ. пурытан і новай бурж.-дваранскай апазіцыі абсалютызму і англіканскай царкве. Адмаўляліся царкву за яе сувязь з дзяржаваю, выступалі за аўтаномію кожнай рэліг. абшчыны. Як паліт. партыя — радыкальнае крыло ў парламенце, абаранялі інтарэсы сярэдніх слаёў гандл.-прамысл. буржуазіі і сярэдняга дваранства, якое абуржуазілася. Пад кіраўніцтвам О. *Кромвеля* ўзначалілі паўстанне супраць абсалютызму Сцюартаў. Пасля ваен. перамогі над каралём (1646) адбыўся раскол партыі І.— вылучылася дэмакр. крыло *левелераў*. Як рэліг. плынь (кангрэгацыяналісты) існуе ў ЗША, Вялікабрытаніі, Нідэрландах, Швецыі і інш.

Літ.: Английская буржуазная революция XVII в., т. 1—2, М., 1954.

ІНДЭТЭРМІНІЗМ (лац. determinare вызначаць+in адмаўленне), вучэнне, якое ў процілегласць *дэтэрмінізму* адмаўляе аб'ектыўную, усеагульную, прычынную залежнасць з'яў прыроды, грамадства і мыслення.

Матэрыялісты разумеюць дэтэрмінізм як адлюстраванне аб'ектыўных формаў універсальнай сувязі рэчаў. Ідэалісты процілегласць яму розныя варыянты І. і тэлеалогіі. Сучасныя бурж. філосафы адмаўляюць гістар. дэтэрмінізм, які разглядае развіццё грамадства як заканамерны пераход ад адной грамадска-эканам. фармацыі да другой, і атаясамліваюць яго з *фаталізмам*. Спецыфічны характар прычынных залежнасцей у мікрасвеце даў падставу шэрагу сучасных бурж. прыродазнаўцаў сцвярджаць, што мікрапрацэсы поўнасцю індэтэрмінаваныя. Беспадстаўнасць І. пацвярджаюць навука, практыка людзей.

Літ.: Омельяновский М. Э. Философские вопросы квантовой механики, М., 1956; Диалектический материализм как методология естественнонаучного познания, Мн., 1965; Готт В. С. Философские вопросы современной физики. М., 1967; Бунге М. Причинность, пер. с англ., М., 1962.

Л. Р. Крайчанка. Мінск.

ІНЕЙ, белыя ледзяныя крышталі розпаю формы, якія ўтвараюцца на зямной паверхні і наземных прадметах у халодныя ясныя і ціхія ночы.

Узнікае, калі вадзяная пара паветра, асядаючы на паверхню глебы, траву, снежнае покрыва і на верхнія паверхні прадметаў, якія ў выніку радыяцыйнага ахаладжэння маюць адмоўныя т-ры, ніжэйшыя за т-ру паветра, ператвараецца ў крышталі лёду. І. адрозніваюць ад *шэрані*, якая ўтвараецца пры тумане ў мароз.

ІНЁКЦЫЯ, тое, што *ўпырскванне*.

ІНЕРВАЦЫЯ (лац. in унутры+nervus перв), забяспечанасць органаў і тканак нервовымі клеткамі і валокнамі.

Большасць шкілетных мышцаў інервуецца цэнтральнай нерв. сістэмай; унутр. органы, залозы, сасуды, гладкія і часткова шкілетныя мышцы — вегетатыўнай перв. сістэмай. Нармальная дзейнасць органаў і тканак ажыццяўляецца цэнтрабежнымі (эферэнтнымі) валокнамі — па іх імпульсы перадаюцца да рабочых органаў, і цэнтраімклівымі (аферэнтнымі) нерв. валокнамі — па іх імпульсы ідуць да цэнтр. нервовай сістэмы ці вегетатыўных цэнтраў.

Літ.: Давыдовский И. В. Общая патология человека, 2 изд., М., 1969; Многотомное руководство по неврологии, т. 1, кн. 2, М., 1960; Вопросы морфологии периферической нервной системы (под ред. Д. М. Голуба), Мн., 1963.

П. П. Прыгун. Мінск.

ІНЕРТНЫЯ ГАЗЫ (ад лац. iners бяздзейны), высакародныя газы, хім. элементы VIII групы перыяд. сістэмы Мендзялеева: *гелій* He, *неон* Ne, *аргон* Ar, *крыптон* Kr, *ксенон* Xe і *радон* Rn. Знаходзяцца ў паветры і ў газах зямной кары ў нязначных колькасцях (напр., у паветры аргону 0,9325%, ксенону 0,000008% па аб'ёме). Утвараюцца ў выніку прыродных ядз. працэсаў. Характарызуюцца выключнай хім. пасіўнасцю, таму адкрыты пазней за інш. элементы (1868—1908).

Малекулы І. г.— аднаатамныя. Атамы маюць устойлівую вонкавую электронную абалонку (у гелію з 2 электронаў, у астатніх з 8). Пачынаючы з 1962, атрыманы шэраг злучэнняў І. г. (крыптону, ксенону, радону). Гэта сапраўдныя хім. злучэнні з каваленткімі сувязямі. У прамысл. І. г. атрымліваюць пераважна з паветра. Метад раздзялення іх распрацаваны сав. вучоным В. А. Нікіціным. Ужываюцца ў электра- і радыётэхн. вытворчасці для напаўнення розных лямпаў, у электронных прыладах, вакуумнай тэхніцы.

Літ.: Фастовский В. Г., Ровинский А. Е. и Петровский Ю. В. Инертные газы, М., 1964; Соединения благородных газов, пер. с англ., М., 1965.

В. В. Хадыка. Мінск.

ІНЕРЦЫЙНЫ АКУМУЛЯТАР, прыстасаванне для назапашвання механічнай энергіі вярчэння. Складаецца з масіўнага махавіка, вала, падшыпнікаў і кажуха. Мае мінімальныя страты энергіі на трэнне і супраціўленне паветра.

Скансгруяваны сав. вынаходнікам А. Г. Уфімцавым і выкарыстаны ім (разам з У. П. Вятчынкіным) у *ветраэлектрычных станцыях* для выраўноўвання абаротаў генератара. Можа выкарыстоўвацца таксама для прывода аўтаматрыс і аўтобусаў (гіробусаў). На станцыях сілкавання электрарухавік гіробуса падключаецца да эл. сеткі і раскручвае злучаны з ім махавік. Потым эл. рухавік пераводзіцца ў рэжым генератара і сілкуе цягавы электрарухавікі гіробуса. Энергіі махавіка хапае на некалькі км шляху. Выкарыстоўваецца таксама ў прэсавым абсталяванні.

ІНЕРЦЫЯ ў механіцы (ад лац. iners бяздзейны), уласцівасць матэрыяльнага цела захоўваць стан раўнамернага прамалінейнага руху (ці спакою) пры адсутнасці знешніх сіл або калі гэтыя сілы ўзаемна ўраўнаважаныя. Мера І. цела — *маса*; чым большая маса, тым павольней мяняецца скорасць пры ўздзеянні на цела адной і той жа сілы. Уласцівасці руху целаў, звязаныя з І., апісваюцца першым законам механікі (законам І.). Гл. таксама *Ньютана законы механікі*.

«ИНЖЕНЕРНО-ФИЗИЧЕСКИЙ ЖУРНАЛ», усесаюзны штомесячны навуковы часопіс Дзярж. камітэта Савета Міністраў СССР па навуцы і тэхніцы і АН БССР. Выдаецца ў Мінску з 1958 на рус. мове. Асн. навук. кірунак — цеплафізіка, энерга-, цепла- і масаперанос, тэрмадынаміка неабарачальных працэсаў, метады вызначэння цеплафізічных, рэалагічных і інш. характарыстык калоідных і капілярнапорыстых целаў, а таксама шматкампанентных сумесей газаў і вадкасцей. У складзе рэд. савета вядомыя вучоныя-цеплафізікі СССР і сацыяліст. краін. Гал. рэд. акад. АН БССР А. В. Лыкаў (з 1958).

А. В. Лыкаў. Мінск.

ІНЖЫНЕРНА-БУДАЎНІЧАЯ АДУКАЦЫЯ, сістэма падрыхтоўкі інжынерных кадраў будаўнічага профілю.

Гісторыя развіцця буд. адукацыі звязана з *архітэктурнай адукацыяй*. У 1757 у Пецярбурзе засн. Акадэмія жывапісу, скульптуры і архітэктуры. У 1773 у Пецярбурзе адкрыта Вышэйшае горнае вучылішча (з 1956 Ленінградскі горны ін-т імя Пляханава), якое рыхтавала горных інжынераў па праектаванні і буд-ве плацін, шлюзаў, фундаментаў і розных умацаванняў. Для падрыхтоўкі інжынераў па праектаванні і буд-ве дарог і мастоў у 1809 у Пецярбурзе засн. Ін-т корпуса інжынераў шляхоў зносін (з 1930 Ленінградскі ін-т інжынераў чыг. транспарту). Першая ў Расіі спецыялізаваная ВНУ па падрыхтоўцы інжынераў-будаўнікоў — Вучылішча грамадз. інжынераў (засн. ў Пецярбурзе ў 1832), рыхтавала спецыялістаў шырокага профілю (з 1882 Ін-т грамадз. інжынераў, з 1941 Ленінградскі інж.-будаўнічы ін-т). Як самастойная галіна вышэйшай адукацыі І.-б. а. пачала развівацца пасля Кастр. рэвалюцыі. У 1918 пры Маскоўскім выш. тэхн. вучылішчы арганізаваны інж.-буд. ф-т. У 30-я гады ствараюцца інж.-буд. ін-ты, аддзяленні і ф-ты гэтага профілю пры політэхн. ін-тах.

У СССР (1971) 24 інжынерна-буд. ін-ты і больш як 110 ф-таў пры іншых ВНУ. У БССР інжынераў-будаўнікоў рыхтуюць *Брэсцкі інжынерна-будаўнічы інстытут*, буд. ф-т Бел. політэхн. ін-та, ф-т прамысл. і грамадз. буд-ва Бел. ін-та інжынераў чыг. транспарту, Наваполацкі філіял Бел. тэхнал. ін-та імя Кірава, на дзённых, вячэрніх і завочных ф-тах і аддзяленнях якіх навучаецца (1971) каля 10 тыс. студэнтаў. Падрыхтоўка інжынераў-будаўнікоў вядзецца па 14 спецыяльнасцях. Гл. таксама *Інжынерна-будаўнічыя інстытуты*.

І. І. Леановіч. Мінск.

ІНЖЫНЕРНА-БУДАЎНІЧЫЯ ІНСТЫТУТЫ, вышэйшыя навуч. ўстановы, якія рыхтуюць спецыялістаў па архітэктуры, прамысл. і грамадз. буд-ве, вытворчасці бетонных і жалезабетонных вырабаў і канструкцый для зборнага буд-ва, водазабеспячэння і каналізацыі, цеплагазазабеспячэння і вентыляцыі, па будаўнічых і дарожных машынах і абсталяванні. Інжынераў-будаўнікоў рыхтуюць таксама на буд. ф-тах некаторых політэхн. ін-таў, ін-таў інжынераў чыг. транспарту і інш.

У СССР (1971) 24 інжынерна-будаўнічыя ін-ты: Адэскі (з 1930), *Брэсцкі інжынерна-будаўнічы інстытут* (1966), Валгаградскі інжынераў гар. гаспадаркі (1952), Варонежскі (1930), Вільнюскі (1970), Горкаўскі імя Чкалава (1930), Днепрапятроўскі (1930), Кавапскі (1946), Кіеўскі (1930), Куйбышаўскі імя А. І. Мікаяна (1930), Ленінградскі (старэйшы інж.-буд. ін-т у краіне, засн. ў 1832 як Ін-т грамадз. інжынераў), Маскоўскі імя Куйбышава (1921), Новасібірскі імя Куйбышава

(1930), Пензенскі (1958), Палтаўскі (1930), Растоўскі (1944), Самаркандскі архітэктурна-будаўнічы (1967), Томскі (1952), Усесаюзны завочны (Масква, 1944), Усць-Каменагорскі буд.-дарожны (1958), Харкаўскі (1930), Харкаўскі інжынераў камунальнага буд-ва (1930), Целінаградскі (1965), Цюменскі (1971). Навучанне (апрача Усесаюзнага завочнага) дзённае, вячэрняе, завочнае. Кіеўскі, Ленінградскі і Маскоўскі прымаюць да абароны канд. і доктарскія дысертацыі; Горкаўскі, Новасібірскі, Адэскі і Харкаўскі — канд. дысертацыі. Тэрмін навучання 5—6 гадоў. Выпускнікам прысвойваецца кваліфікацыя інжынера-будаўніка, інжынера-гідратэхніка, інжынера-механіка і інш. Гл. таксама *Інжынерна-будаўнічая адукацыя*.

ІНЖЫНЕ́РНА-ЭКАНАМІ́ЧНАЯ АДУКА́ЦЫЯ, сістэма падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі па эканоміцы для прамысловасці, буд-ва, транспарту, сувязі і інш. галін народнай гаспадаркі.

Як самастойная галіна вышэйшай адукацыі пачала развівацца пасля Кастр. рэв. У 1923 створаны Маскоўскі прамысл.-эканам. ін-т, у складзе якога быў інж.-эканам. ф-т (у 1930 на базе гэтага ф-та створаны Маскоўскі інж.-эканам. ін-т). У 1930 засн. Ленінградскі і Харкаўскі інж.-эканам. ін-ты (гл. *Інжынерна-эканамічныя інстытуты*). Інжынерна-эканам. кадры з вышэйшай адукацыяй рыхтуюць таксама інж.-эканам. ф-ты Ленінградскага, Львоўскага, Усесаюзнага завочнага (Масква), Казахскага, Кішынёўскага, Краснадарскага, Кузбаскага, Адэскага, Рыжскага, Талінскага, Уральскага, Хабараўскага політэхн. ін-таў, некаторыя інш. тэхнічныя ВНУ (Ленінградскі карабельбудаўнічы, Іжэўскі механічны, Маскоўскі авіяцыйны, Ленінградскі горны і інш. ін-ты). У БССР І.-э. а. ажыццяўляецца на інж.-эканам. ф-це (з 1966) Бел. політэхн. ін-та, на тэхнал. ф-це Віцебскага тэхнал. ін-та лёгкай прамысловасці.

ІНЖЫНЕ́РНА-ЭКАНАМІ́ЧНЫЯ ІНСТЫТУ́ТЫ, вышэйшыя навуч. ўстановы, якія рыхтуюць інжынераў-эканамістаў для прамысловасці, буд-ва, транспарту і інш. галін. нар. гасп. па спецыяльнасцях: эканоміка і арг-цыя машынабуд. прамысловасці, эканоміка і арг-цыя хім. прамысл., эканоміка і арг-цыя энергетыкі, эканоміка і арг-цыя буд-ва, эканоміка і арг-цыя аўтамаб. транспарту і інш.

У СССР у 1971 тры І.-э. і.: Маскоўскі (з 1923), Ленінградскі (з 1930), Харкаўскі (з 1930). Ва ўсіх ін-тах навучанне дзённае, вячэрняе і завочнае, ёсць аспірантура. Маскоўскі і Ленінградскі ін-ты прымаюць да абароны канд. і доктарскія дысертацыі, Харкаўскі — канд. дысертацыі. Падрыхтоўка кадраў па інж.-эканам. спецыяльнасцях ажыццяўляецца ў некаторых політэхн., машынабуд., горных і інш. ВТНУ. У БССР інжынераў-эканамістаў рыхтуе Бел. політэхн. ін-т па спецыяльнасцях: эканоміка і арг-цыя маш.-буд. прамысловасці, эканоміка і арг-цыя буд-ва, эканоміка і арг-цыя аўтамаб. транспарту; Віцебскі тэхнал. ін-т па спецыяльнасцях: эканоміка і арг-цыя прамысловасці прадметаў шырокага ўжытку, эканоміка і арг-цыя быт. абслугоўвання. Выпускнікам прысвойваецца кваліфікацыя інжынера-эканаміста адпаведнай спецыяльнасці. Гл. таксама *Інжынерна-эканамічная адукацыя*.

ІНЖЫНЕ́РНАЯ ГЕАЛО́ГІЯ, галіна *геалогіі*, якая вывучае верхнія гарызонты зямной кары і яе дынаміку ў сувязі з інжынернай дзейнасцю чалавека, фізіка-мех. ўласцівасці горных парод і змены іх у часе, геал. працэсы, іх прагнозную ацэнку і накіраванасць.

Уключае *грунтазнаўства* (гл. таксама *Грунт*), інж. геадынаміку і рэгіянальную І. г., цесна звязаныя паміж сабою і з інш. навукамі (гідрагеалогіяй, петраграфіяй, калоіднай хіміяй, матэматыкай). Інж. геадынаміка распрацоўвае колькасныя метады прагнозу прыродных геал. і інж.-геал. працэсаў і з'яў (прасадкі, апоўзняў, карсту, абвалаў, сейсмічных з'яў), каб выявіць іх прыроду, прычыны ўзнікнення і развіцця. Сувязным звяном паміж грунтазнаўствам і інж. геадынамікай з'яўляецца *механіка грунтоў*. Рэгіянальная І. г. вывучае геал. ўмовы на вял. плошчах у сувязі з планаваннем, буд-вам і эксплуатацыяй вялікіх інж. збудаванняў, кар'ераў, вадасховішчаў, распрацоўвае прагнозы працэсаў і з'яў, якія ўзнікаюць пры ўзаемадзеянні гэтых збудаванняў з прыроднымі абставінамі, і шляхі магчымага ўздзеяння на працэсы і з'явы ў пажаданым кірунку.

На Беларусі тэарэт. пытанні грунтазнаўства і механікі грунтоў вывучаюць у Ін-це буд-ва і арх. Дзяржбуда БССР, на кафедры асноў і фундаментаў БПІ і інш.; пошукі пад буд-ва выконвае Бел. дзярж. ін-т інж. вышуканняў Дзяржбуда БССР і інш.; рэгіянальныя інж.-геал. даследаванні — арг-цыі Упраўлення геалогіі пры СМ БССР.

Літ.: Маслов Н. Н. и Котов М. Ф. Инженерная геология, М., 1971; Попов И. В. Инженерная геология, 2 изд., М., 1959; Проблемы инженерной геологии, М., 1970; гл. таксама літ. пры арт. *Грунт, Грунтазнаўства*.

У. Р. Лабадзенка. Мінск.

ІНЖЫНЕ́РНЫЯ ВАЙСКІ, войскі, прызначаныя для інжынернага забеспячэння баявых дзеянняў.

Складаюцца з інжынерна-сапёрных, інжынерна-дарожных, пераправачна-дэсантных, пантонна-маставых, інжынерна-пазіцыйных і інш. спец. часцей і падраздзяленняў. Забяспечваюць баявыя дзеянні войскаў, разгароджваюць і пракладваюць калонныя шляхі, наводзяць пераправы цераз водныя перашкоды, памагаюць блакіраваць і знішчаць агнявыя збудаванні праціўніка. Маюць неабходную інж. тэхніку і іншыя сродкі.

ІНЖЫНЕ́РНЫЯ ЗАГАРО́ДЫ, інжынерныя сродкі і збудаванні (штучныя перашкоды), якія робяць на мясцовасці перад боем ці ў час бою, каб затрымаць ці спыніць рух праціўніка наперад.

Паводле прызначэння бываюць процітанкавыя, процітранспартныя і процідэсантныя, паводле характару дзеяння — мінавыбуховыя (мінныя палі, фугасы) і невыбуховыя (равы, надаўбні, драцяныя загароды і інш.).

ІНЖЫ́Р, смакоўніца, фігавае дрэва (Ficus carica), двухдомнае пладовае субтрапічнае дрэва сям. тутавых. Вырошчваецца І. у Турцыі, Алжыры, ЗША і інш. краінах. У СССР — у рэспубліках Сярэдняй Азіі, Крыме і на Каўказе. Вядома больш за 600 сартоў.



Галінка інжыру з пладамі.

Выш. да 15 *м* і больш. Лісце пальчатаслопасцевае, знізу апушанае. Кветкі ўнутры грушападобных мясістых суквецця ў дзвюх формах (капрыфігах на мужчынскіх дрэвах, фігах — на жаночых). Плод — дробная сямянка ўнутры суплоддзя, запоўненага салодкаю мякаццю. У сушаных пладах (вінных ягадах) да 75% цукру, шмат вітаміну А і С.

Літ.: Нестеренко Г. А. и Стребкова А. Д. Инжир, М., 1949; Рыбицкий Н. А. и Гаврилов И. С. Дикорастущие плоды и ягоды, Л., 1969.

ІНЖЭ́КТАР (ад лац. injicio укідваю), *струменны апарат* для напампоўвання вадкасці (газу, пары) у сасуд пад ціскам з выкарыстаннем кінетычнай энергіі струменю іншай вадкасці (газу, пары). Ужываецца, напр., для сілкавання вадою паравых катлоў (гл. рыс.).

Вадзяная пара з катла праходзіць праз клапан, сапло ў змешвальную камеру, дзе яна часткова кандэнсуецца. Ад кандэнсацыі ствараецца разрэджванне (вакуум), пад дзеяннем якога ў змешвальную камеру ўсмоктваецца вада з асобнага рэзервуара. Далей сумесь вады з параю праз канфузар з вялікай скорасцю паступае ў дыфузар, у якім, апрача далейшай кандэнсацыі пары, меншае скорасць патоку, што павялічвае ціск. Потым вада пад ціскам праз аваротны клапан паступае ў катёл.



Схема інжэктара: *1* — сілкавальная труба; *2* — змешвальная камера; *3* — параўпускны клапан; *4* — сапло; *5* — канфузар; *6* — аваротны клапан; *7* — дыфузар; *8* — камера разрэджвання; *9* — кантрольны клапан; *10* — паравы кацёл.

ІНКАРПАРАТЫЎНЫЯ МО́ВЫ (полісінтэтычныя мовы), мовы, у якіх адным з спосабаў сінтаксічнай сувязі слоў з'яўляецца інкарпарацыя — аб'яднанне ў адно слова гал. члена сказа і залежных ад яго слоў.

Аб'яднанне марфем у І. м. адбываецца па прыпыне аглюцінацыі, гэта вбліжае І. м. з *аглюцінатыўнымі мовамі*. У некат. І. м. бывае таксама ўнутраная флексія — адзнака *флектыўных моў*. І. м.: палеаазіяцкія (чукоцкая, ніўхская і інш.) і некат. мовы індзейцаў Паўн. Амерыкі (дакота, нутка, пают і інш.).

ІНКАРПАРА́ЦЫЯ (лац. inkorporatio уключэнне), спосаб сістэматызацыі заканадаўства ў алфавітным, храналагічным парадку ці па асобных галінах права без змен іх зместу. Гл. *Сістэматызацыя дзейных законаў*.

ІНКА́СА, аперацыя атрымання грошай банкам па даручэнні кліента (на аснове грашовых, таварных ці разліковых дакументаў) і залічэнне іх на яго банкаўскі рахунак.

У СССР інкасавыя аперацыі праводзяцца пры *безнаяўных разліках* у акцэптнай форме за тавары і паслугі, а таксама ў міжнар. разліках. У капіталіст. краінах інкасавая аперацыя — звычайная камерцыйная паслуга банка за пэўную плату.

ІНКВІЗІ́ЦЫЯ (лац. inquisitio расследаванне), судова-паліцэйская ўстанова каталіцкай царквы для барацьбы з ерэтыкамі, вальнадумцамі, антыцаркоўным і антыфеад. рухам. Ажыццяўляла духоўную цэнзуру над выданнем навук. і маст. л-ры, выдавала т. зв. *індэкс забароненых кніг*. Вызначалася жорсткасцю і фанатызмам. Метады І. ўжывалі пратэстанцкая і праваслаўная цэрквы.

Створана ў пач. 13 ст. на Пд Францыі ў перыяд *альбігойскіх войнаў*, потым пашырылася ў большасці краін Зах. Еўропы, пасля перанесена ісп. і партуг. каланізатарамі ў Амерыку. З 1232 папа рымскі перадаў І. ордэну *дамініканцаў*, часткова *францысканцаў*. У каталіцкіх краінах сярэдневяковай Еўропы была сродкам масавага тэрору супраць тых, хто думаў ці рабіў інакш, чым патрабавала каталіцкая царква. У Вял. княстве Літ. І. уведзена ў 1436, каб зламаць супраціўленне сельніцтва палітыцы акаталічвання, скасавана праз 43 гады. У Зах. Еўропе І. закатавала і знішчыла мільёны людзей. Ахвярамі яе сталі многія выдатныя дзеячы навукі і культуры (спалены жывымі Дж. Бруна, Л. Ваніні, праследаваліся Т. Кампанела, Г. Галілей). Ліквідавана ў большасці краін у 18 ст., у Партугаліі, Іспаніі, Польскай вобл. у 19 ст. Ватыкан захаваў пад назвай Кангрэгацыі свяшчэннай канцылярыі (з 1965 Кангрэгацыя веравучэння) спец. ўстанову, якая часткова выконвае функцыі І. ў барацьбе з перадавой грамадскай і навук. думкай.

Літ.: Григулевич И. Р. История инквизиции (XIII—XX вв.), М., 1970; Лозинский С. Г. Святая инквизиция, М., 1927; Ягож. История папства, М., 1961; Рожицин В. С. Джордано Бруно и инквизиция, М., 1955; Грекулов Е. Ф. Православная инквизиция в России, М., 1964; Ли Г.-Ч. История инквизиции в средние века, пер. с франц., т. 1—2, СПб., 1911—12.

Дз. М. Мацяс. Мінск.

ІНКЛІНАМЕ́ТРЫЯ (ад лац. inklino нахіляю+...*метрыя*), вызначэнне вугла нахілу і азімута скрыўлення свідравіны, каб кантраляваць яе тэхн. стан і атрымліваць неабходныя геал. звесткі.

Вымяраюць вугал нахілу і азімут інклінометрам (у верт. свідравінах звычайна праз 25 *м*, радзей — праз 50 *м*, у нахіленых — праз 10 або 5 *м*). Існуе шмат тыпаў інклінометраў у залежнасці ад дыяметра свідравіны, т-ры і ціску асяроддзя і інш. Паводле дадзеных І. складаюць інклінаграмы, якія выкарыстоўваюцца пры геалагічных графічных пабудовах. Гл. таксама *Каратаж*.

Літ.: Комаров С. Г. Геофизические методы исследования скважин, М., 1963; Федынский В. В. Разведочная геофизика, М., 1967.

ІНКРУСТА́ЦЫЯ (ад лац. incrustatio пакрыццё чым-небудзь), раздзел дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва; тэхніка выканання дэкаратыўнай кампазіцыі з пласцінак перламутру, слановай косці, шкла, золата, серабра, каштоўных камянёў, якія ўразаюцца ў паверхню прадмета з дрэва, каменю або металу; творы, выкананыя гэтай тэхнікай.

Мастацтва І. вядома з глыбокай старажытнасці, шырока выкарыстоўвалася ў рамёствах Індыі, Кітая, Японіі, Візантыі. Разнавіднасць І.— інтарсія (вынва на паверхні прадмета выконвецца ўрэзанымі ў дрэва пласцінкамі з дрэва інш. парод, часта з дабаўленнем косці, перламутру, металу), якая дасягнула высокага ўзроўню ў 15—16 ст. у Італіі (сцянныя панелі), у 17 ст. ў Францыі (мэблі А. Ш. Буля), у 18 ст. ў Расіі (мэблі Н. Васільева і М. Вераценнікава). Разнавіднасць інтарсіі — маркетры (т. зв. «наборнае дрэва» — тэхніка паклейкі на простае дрэва фігурнай фанеры каштоўных парод дрэва). У бел. сав. мастацтве пашырыліся інтарсія і маркетры (вырабы Я. Арлова, С. Вольскага, І. Шубадзёрава і інш.). У 40—60-я г. ў інтарсіі працуюць Р. Гебелеў, Дз. Сакажынскі, А. Сліжыкаў, М. Рубінчык, К. Цяўлоўскі, Р. Чарноў, М. Шудрык, у тэхніцы маркетры — сям'я Ганакоў, В. Мягкоў і інш.

І. М. Паньшына. Мінск.

ІНКРЭ́ТЫ, тое, што *гармоны*.

ІНКУБА́ТАР (ад лац. incubo, тут — выседжваю птушанят), установа для штучнага вывядзення маладняку с.-г. птушак; асноўнае абсталяванне інкубатарна-птушкагадоўчых станцый. Бываюць секцыйныя (напр., «Піянер»), пакаёвыя («Рэкорд-39») і шафавыя («Універсал-45», «ВІР-9»).

Найб. пашыраны І. шафавага тыпу. Складаюцца з інкубацыйнага і вывяднога апаратаў. Свежыя яйцы закладваюцца ў латкі інкубацыйнага апарата, дзе праходзяць стадыю інкубацыі. У І. падтрымліваюцца пэўныя т-ра (да 37,5 °С), паветраабмен і вільготнасць. Працягласць інкубацыі курыных яец 21 дзень, качыных і індычых 27—28, гусіных 29 дзён. Пасля яйцы перакладваюцца ў вывадны апарат, дзе птушаняты вылупліваюцца. Птушкафермы БССР, у т. л. Смалявіцкая бройлерная птушкафабрыка, абсталяваны пераважна І. «Універсал-45» (умяшчальнасць каля 44 тыс. курыных яец). Выпускаюцца таксама больш дасканалыя І., напр. «Універсал-50» (умяшчальнасць 51 тыс. курыных яец).

Літ.: Отрыганьев Г. К., Хмыров В. А. и Колобов Г. М. Инкубация, М., 1964; Инкубатор «Универсал-45», М., 1959. *А. А. Рунцо.* Мінск.

ІНКУБАТАРНА - ПТУШКАГАДОЎЧАЯ СТАНЦЫЯ (ІПС), дзярж. прадпрыемства, дзе праводзяць інкубацыю яец с.-г. птушак. Забяспечвае маладняком птушкагадоўчыя фермы калгасаў і саўгасаў. Ажыццяўляе заатэхн. мерапрыемствы па паляпшэнні парод птушак і павелічэнні іх прадукцыйнасці, памагае арганізоўваць і абслугоўваць племянныя і таварныя фермы.

У раёне ІПС ствараюцца племянныя фермы, якія пастаўляюць яйцы для інкубацыі. ІПС абсталяваны сучаснымі *інкубатарамі*. У БССР 19 ІПС, на якіх можна інкубаваць 4 млн. 890 тыс. яец (на 1.1.1972). Сярэдні вывад маладняку 78%, на перадавых ІПС больш за 80%.

Літ.: Отрыганьев Г. К., Хмыров В. А. и Колобов Г. М. Инкубация. М., 1964; Николаева Ю. Н. О некоторых вопросах теории и практики инкубации яиц водоплавающих птиц, у кн.: Труды Белорусского научно-исследовательского ин-та животноводства, т. 3, Мн., 1962.

М. А. Стрыбук. Жодзіна.

ІНСАРАЎ Іван Апісімавіч [н. 26.1(8.2).1903, в. Селішча Слуцкага пав. Мінскай губ.], дзярж. дзеяч БССР. Праф. (1964), засл. ўрач БССР (1964). Чл. КПСС з 1941. Скончыў мед. ф-т БДУ (1927). Удзельнік Айч. вайны і партыз. руху на Беларусі (1941—45). У 1948—66 міністр аховы здароўя БССР, з 1967 гал. рэдактар час. «Здравоохранение Белоруссии», заг. кафедры БДУ. Працы па арганізацыі і гісторыі аховы здароўя ў БССР, дзейнасці медыка-сан. службы ў партыз. злучэннях. На XX, XXI, XXIV—XXVI з'ездах КПБ выбіраўся чл. ЦК, на XXII, XXIII — канд. у чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета БССР 3—6-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Кастр. Рэвалюцыі, 5 інш. ордэнамі, медалямі.

Тв.: Медицинская служба в партизанских соединениях Белоруссии, «Здравоохранение Белоруссии», 1964, № 7.

ІНСЕКТЫЦЫДНЫЯ РАСЛІНЫ, расліны, якія назапашваюць у розных органах атрутныя для насякомых рэчывы (алкалоіды, гліказіды, сапаніны, складаныя эфіры, эфірныя алеі і інш.). З іх атрымліваюць *інсектыцыды*, якія знішчаюць шкоднікаў с.-г. раслін і лесу, свірпавых шкоднікаў, паразітаў свойскай жывёлы, насякомых у быце.

У СССР культывуюцца і маюць прамысл. значэнне анабазіс безлісты, тытунь, махорка, клешчавіна звычайная, рамонкі — далматскі, каўказскі, персідскі і інш. На выраб інсектыцыдаў ідуць таксама аксамітнае дрэва, багун, некат. віды акацыяцца, мыльнік, жыгунец, уман і інш.

Літ.: Трошин Д. М. Инсектисидные ромашки и их применение, М., 1948; Соколов В. С. Алкалоидоносные растения СССР. М.—Л., 1952; Вульф Е. В. и Малеева О. Ф. Мировые ресурсы полезных растений. Справочник, Л., 1969.

В. М. Прусакова. Мінск.

ІНСЕКТЫЦЫДЫ (ад лац. insectum насякомае+caedo забіваю), хім. рэчывы для знішчэння насякомых — шкоднікаў раслін, прадуктаў і матэрыялаў (драўніны, воўны, скуры і інш.), пераносчыкаў інфекцыі, паразітаў чалавека і жывёл. Бываюць І. сінтэтычныя і раслінага паходжання.

Дзеляцца на 4 групы. Кантактавыя І., які, трапляючы на любую частку цела насякомага, выклікаюць яго гібель. Да іх належаць гексахларан (пераважна гама-ізамер), хлорцыкладыены, фосфарарган. І., перэтрыны, анабазін-сульфат, нікацін-сульфат і інш. Кішачныя І. (пераважна неарган. рэчывы) трапляюць у арганізм насякомага праз рот. Сістэмныя І. (у большасці фосфарарган. злучэнні) пранікаюць у сасудзістую сістэму раслін і жывёл і робяць іх атрутнымі для насякомых. Фумігантны (лятучыя злучэнні, напр., дыхлорэтан, хлорпікрын і інш.) трапляюць у арганізм насякомага праз органы дыхання. Да І. належаць таксама хім. рэчывы, здольныя закупорваць дыхальныя шляхі і выклікаць гібель насякомага ад удушша. Некат. з прэпаратаў, што ўжываюцца ў якасці І. аказваюць адначасова кантактавае, кішачнае і фумігацыйнае дзеянне. Выпрабляюць І. ў парашках, растворах, эмульсіях, суспензіях. Амаль усе І. атрутныя для чалавека і жывёл, пры рабоце з імі неабходна выконваць меры засцярогі. Гл. таксама *Акарыцыды, Пестыцыды*.

А. Ф. Маркавец. Жодзіна.

ІНСПЕКЦЫЯ (лац. inspectio агляд), 1) сістэма нагляду за дзейнасцю ўстаноў і асоб або яе эпізадычная праверка. 2) Установа, якая ажыццяўляе нагляд. Гл. *Дзяржаўная інспекцыя*.

ІНСТРУМЕНТАЛІЗМ, суб'ектыўна-ідэалістычны філасофскі кірунак, разнавіднасць *прагматызму*. Заснавальнік Дж. *Дзьюі*.

Галоўнае паняцце І.— «сітуацыя», што складваецца паміж арганізмам, або цэнтрам, і асяроддзем. Як арганізм могуць выступаць жывёліна, чалавек, грамадства, любая фізіял. або сац. структура. У залежнасці ад арганізма, яго дзейнасці асяроддзе набывае рысы акрэсленасці, устойлівасці, паўтаральнасці. Сродкі, якія выкарыстоўвае арганізм, каб дасягнуць акрэсленасці, выступаюць як інструменты ўпарадкавання (адсюль і назва І.). Яны разглядаюцца толькі ў плане функцыянальным, аб'ектыўнага зместу не маюць. І. падмяняе праблему адносін мыслення да быцця праблемай адносін арганізма да асяроддзя. Лічыць пазнанне інструментам, які людзі адвольна выкарыстоўваюць у сваіх мэтах незалежна ад ісціннасці пазнання.

Літ.: Корифорт М. В защиту философии. Против позитивизма и прагматизма, пер. с англ., М., 1951; Кроссер П. К. Нигилизм Джона Дьюи, пер. с англ., М., 1958; Антонович И. И. Американская буржуазная аксиология на службе империализма, Мн., 1967.

Г. П. Давідзюк. Мінск.

ІНСТРУМЕНТАЛЬНАЯ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ, галіна прамысловасці па вытворчасці інструменту і аснасткі для патрэб народнай гаспадаркі, пераважна для машынабудавання і металаапрацоўкі. Асн. прадукцыя: рэзальны, вымяральны, заціскны, слясарна-мантажны, даўбёжны інструмент, штампы, прэс-формы і інш. прылады і прыстасаванні.

У дарэвалюц. Беларусі на некат. прадпрыемствах былі інструментальныя ўчасткі, дзе выраблялся пераважна ручны інструмент: напільнікі, долаты, малаткі, свердлы і г. д. У БССР на буйных маш.-буд. прадпрыемствах (Гомсельмаш, віцебскія станкабуд. імя Кірава і імя Камінтэрна, мінскія станкабуд. імя Кастр. рэв. і імя Кірава з-ды і інш.) пабудаваны інструментальныя цэхі і ўчасткі. Пасля Айч. вайны развіцця І. п. ў БССР паскорана хуткім ростам машынабудавання і металаапрацоўкі. У 1970 аб'ём вытворчасці металаапрацоўчага інструменту ў рэспубліцы павялічыўся ў параўнанні з 1965 на 75%. Спецыялізаваныя прадпрыемствы І. п. БССР (1971): Мінскі і Барысаўскі інструментальныя з-ды, Мінскі з-д спец. інструменту і тэхнал. аснасткі (забяспечваюць патрэбы прамысловасці рэспублікі ў металаапрацоўчым інструменце на 65%), Кобрынскі інструментальны, Баранавіцкі з-д станкапрылад, Гродзенскі з-д тэхнал. аснасткі, а таксама інструментальныя цэхі машына- і станкабуд. з-даў Мінска, Гомеля, Віцебска, Магілёва. У Оршы будуецца (1971) з-д нармалізаванага інструменту для аўтаматычных ліній. Найб. буйныя спецыялізаваныя інструментальныя з-ды СССР: маскоўскія — «Калібр», «Фрэзер» імя Калініна, Маскоўскі інструментальны з-д (МІЗ), Сестрарэцкі імя Васкова, ленінградскі з-д разцоў «Коксагазавы», Свярдлоўскі, Вільнюскі, Новасібірскі, Калінінскі імя 1 Мая, Харкаўскі з-д тэхнал. аснасткі і інш. (усяго больш за 70). Значна развіта І. п. у Чэхаславакіі, Польшчы, ГДР. Развіваецца ў Румыніі, Балгарыі, Венгрыі. Сярод капіталіст. краін найб. развітую І. п. маюць ЗША, Вялікабрытанія, ФРГ.

Літ.: Власов В. Ф. Экономика инструментального производства, М.—Л., 1965; Хрящченков В. Г. Планирование и организация инструментального производства в новых условиях, Смоленск, 1967.

В. Г. Храпчанкаў. Мінск.

ІНСТРУМЕНТАЛЬНАЯ СТАЛЬ, вуглародзістая і легіраваная сталь для вырабу рэзальнага, вымяральнага і інш. інструментаў.

У вуглародзістых (У7, У8, У10, У12) 0,6—1,4% вуглароду, за выключэннем І. с. для вырабу штампаў, у якіх 0,3—0,6% вуглароду; у легіраваных (9ХС, ХВ5, Х12Ф1, 4Х2В8) 0,25—2,0% вуглароду і да 10% легіравальных элементаў (хрому, ванадыю, вальфраму, марганцу і інш.). У высокалегіраваных — больш за 10—12% легіравальных элементаў. Высокія эксплуатацыйныя ўласцівасці І. с. дасягаюцца іх тэрмаапрацоўкай (загартоўкай з адпусканнем). Паводле прызначэння І. с. падзяляюцца на: сталі для рэзальнага інструменту, які працуе ў лёгкіх умовах рэзання (малыя скорасць рэзання і падача); сталі для хуткарэзнага інструменту; сталі для вырабу штампаў; сталі для вымяральнага інструменту. У асабліва цяжкіх умовах рэзання металаў замест І. с. выкарыстоўваюцца цвёрдыя сплавы і металакераміка.

Літ.: Геллер Ю. А. Инструментальные стали, 3 изд., М., 1968; Справочник металлиста, под ред. Н. С. Ачеркана, т. 2, 2 изд., М., 1965.

ІНСТРУМЕНТОЎКА, стварэнне *партытуры*; выкладанне муз. твора для розных відаў аркестра, камерных вакальных і інструментальных ансамбляў або хору. Побач з І. як неад'емная частка працэсу напісання твора ў гэтае паняцце ўваходзіць і пералажэнне фп. і інш. твораў для розных інстр. і хар. складаў (аранжыроўка). У муз. практыцы тэрмін ужываецца пераважна ў вузкім сэнсе, як выкладанне для аркестра (аркестроўка).

І. павінна ўсімі сваімі сродкамі (інтанацыйна-тэмбравыя магчымасці, прыёмы гуказдабывання, суадносіны гучнасці, спалучэнні інструментаў) садзейнічаць перадачы ідэйна-эмац. зместу; яна залежыць ад жанру муз. твора і сукупнасці ўсіх кампанентаў муз. мовы (мелодыкі, гармоніі, голасавядзення, рытмікі і інш.). Адна і тая ж тэма пры змене І. набывае розныя сэнсавыя адценні. Развіццё І. цесна звязана са зменай муз. стыляў, з прагрэсам у мастацтве і тэхніцы муз. кампазіцыі, удасканаленнем інструментаў, эвалюцыяй аркестра. Сярод найб. значных майстроў І.: І. Гайдн, В. А. Моцарт, Л. Бетховен, М. Глінка, Г. Берліёз, Р. Вагнер, П. Чайкоўскі, М. Рымскі-Корсакаў, К. Дэбюсі, М. Равель, І. Стравінскі, Р. Штраўс, Дз. Шастаковіч. І.— спец. вучэбная дысцыпліна ў праграмах кансерваторый і муз. вучылішчаў.

Літ.: Римский-Корсаков Н. А. Основы оркестровки, т. 1—2, 2 изд., М.—Л., 1946; Василенко С. Н. Инструментовка для симфонического оркестра, т. 1—2, М., 1952—59; Веприк А. М. Трактовка инструментов оркестра, М., 1961; Яго Ж. Очерки по вопросам оркестровых стилей, М., 1961; гл. таксама літ. пры арт. *Аркестр*.

А. В. Багатыроў. Мінск.

ІНСТЫНКТ (лац. instinctus намер), прыроджаная форма паводзін, уласцівая пэўнаму віду арганізмаў, якія маюць нервовую сістэму. Упершыню І. навукова абгрунтаваў І. П. Паўлаў. Па сваёй прыродзе гэта складаная форма безумоўных рэфлексаў (гл. *Рэфлексы*). Выпрацоўваецца І. у працэсе гістар. развіцця арганізмаў і а'яўляецца прыстасаваннем да пэўных умоў існавання.

У працэсе развіцця арганізма адны І. знікаюць, другія паяўляюцца, напр. у грызуноў дзіцячы І. заменьваецца І. рассялення. Адрозніваюць харчовыя, ахоўныя, паловыя, бацькоўскія, дзіцячыя і інш. І. Некат. відам жывёл уласцівы спецыфічныя І. (І. міграцыі ў пералётных птушак, будаўнічыя ў баброў). Асаблівае значэнне маюць І. ўзаемаадносін дарослых асобін аднаго віду (паводзіны пчол, восаў, мурашак пры пабудове гнёздаў; стадныя І. жывёл — сумесны рух статка млекакормячых, касяка рыб). Інстынктыўная дзейнасць у беспазваночных жывёл рэгулюецца галаўнымі ганглямі, у пазваночных — падкоркавымі цэнтрамі галаўнога мозгу. У адрозненне ад жывёл І. у чалавека не мае вырашальнага значэння. Паводзіны людзей складваюцца пад уплывам спецыф. формаў *вышэйшай нервовай дзейнасці*, вызначаюцца грамадскім быццём, сац. адносінамі. Вывучэнне І. мае практ. значэнне ў жывёлагадоўлі, паляўнічай гаспадарцы, біялагічных метадах барацьбы са шкоднікамі сельскагаспадарчых культур і пераносчыкамі інфекцый.

Літ.: Павлов И. П. Полн. собр. соч., т. 3, кн. 1—2, 2 изд., М.—Л., 1951; Слоним А. Д. Инстинкт. Загадки врожденного поведения организмов, Л., 1967.

А. Н. Курскоў. Мінск.

ІНСТЫТУТ АГУЛЬНАЙ І НЕАРГАНІЧНАЙ ХІМІІ Акадэміі навук БССР, навукова-даследчая ўстанова, якая распрацоўвае тэарэт. і практ. пытанні агульнай і неарган. хіміі.

Засн. ў 1959 у Мінску на базе ін-та хіміі АН БССР (з 1930). Лабараторыі: калійных соляў і мінер. угнаенняў, тэрмадынамікі іонаабменных працэсаў, цвёрдафазных рэакцый, сінтэзу і фізікахіміі гарачаўстойлівых неарган. злучэнняў, сінтэзу шклопадобных матэрыялаў, прыродных адсарбентаў і каталізатараў, сінт. адсарбентаў і сарбцыйных працэсаў. У складзе ін-та група фізічных метадаў даследавання. Аспірантура з 1960. Аб'яднаны вучоны савет ін-таў фізіка-арган. хіміі, агульнай і неарган. хіміі, торфу прымае да абароны канд. і доктарскія дысертацыі па хім. навуках. У ін-це працаваў акад. АН БССР М. А. Безбародаў; працуюць акадэмікі АН БССР М. М. Паўлючэнка, М. Ф. Ярмоленка. Дырэктар чл.-кар. АН БССР У. С. Камароў (з 1966).

Асн. кірункі навук. даследаванняў: фізікахімічныя асновы новых і інтэнсіфікацыя існуючых працэсаў атрымання калійных угнаенняў на базе Старобінскага калійнага радовішча; тэарэт. асновы сінтэзу новых гарачаўстойлівых неарган. матэрыялаў, у т. л. хімічна ўстойлівых шклопадобных пакрыццяў для засцярогі ад карозій металаканструкцый; метады атрымання прыродных і сінтэтычных актыўных адсарбентаў, каталізатараў, іонаабменнікаў і спосабаў рэгулявання іх структуры; працэсы адсорбцыі і тэрмадынамікі іоннага абмену ў шматкампанентных сістэмах; вывучэнне структуры і рэакцыйнай здольнасці хім. злучэнняў у цвёрдым стане. Вынікі навук. даследаванняў: устаноўлена ўздзеянне паверхнева-актыўных рэчываў на агрэгатыўны стан флотарэагентаў у канцэнтраваных салявых растворах, распрацавана агульная тэорыя іоннага абмену ў складаных сістэмах, якія ўтрымліваюць адвольны лік абменных іонаў, сінтэзаваны шэраг новых нізкатэмпературных кіслотна-шчолачаўстойлівых эмаляў і металаўгальных матэрыялаў, прапанаваны механізм фармавання структуры глабулярных адсарбентаў і каталізатараў, распрацаваны тэарэт. асновы павышэння рэакцыйнай здольнасці крышталічных рэчываў увядзеннем у іх састаў радыеактыўных ізатопаў.

Выладзены працы: «Каўчукападобныя палімеры — сарбенты і храматаграфічныя матэрыялы» Р. Л. Старобінца і У. С. Камарова (1959); «Спектраскапія ў хіміі акісленых цэлюлоз» І. М. Ярмоленкі (1959); «Мікраэлементы і калоіды глебаў» М. Ф. Ярмоленкі (1960); «Калійныя солі Беларусі, іх перапрацоўка і выкарыстанне» Х. М. Александровіча і М. М. Паўлючэнкі (1966); «Сінтэз і будова сілікатнага шкла» М. А. Безбародава (1968);

«Тэхналогія калійных угнаенняў» У. В. Пячкоўскага, Х. М. Александровіча і Г. Ф. Пінаева (1968); «Хімія і тэхналогія старажытнага і сярэдневяковага шкла» М. А. Безбародава (1969); «Трыпалі-фасфаты і іх ужыванне» Я. А. Продана, Л. І. Продан і М. Ф. Ярмоленкі (1969); «Адсарбцыйна-структурныя, фізіка-хімічныя і каталітычныя ўласцівасці глінаў Беларусі» У. С. Камарова (1970).

У. С. Камароў. Мінск.

ІНСТЫТУТ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ (Інбелкульт), навукова-даследчая ўстанова БССР, якая існавала з 1922 да 1929, да пераўтварэння ў *Акадэмію навук Беларускай ССР*. Засн. ў Мінску 30.1.1922 на базе Навукова-тэрміналагічнай камісіі Наркамасветы БССР. У 1926 вылучаны са складу Наркамасветы БССР і пераўтвораны ў Дзярж. н.-д. ўстанову пры СНК БССР. У распрацоўцы першага яго статута прымалі ўдзел сав. вучоныя У. І. Пічэта, Я. Л. Дыла, Я. Ф. Карскі. Старшыні Інбелкульта: С. М. Некрашэвіч (1922—24), У. М. Ігнатоўскі (1924—26, з 1927 прэзідэнт).

Спачатку меў гуманітарную (камісіі: слоўнікавая, тэрміналагічная, літаратурна-даследчая) і прыродазнаўчую секцыі. З 1924 у сістэме Інбелкульта створана Цэнтр. бюро краязнаўства. Структура Інбелкульта ў 1927 была зменена і прыблізжана да Акадэміі навук. Ён меў: 2 аддзелы — гуманітарных навук; прыроды і гаспадаркі; кафедры — гісторыі бел. мовы (з камісіяй па складанні гістар. слоўніка бел. мовы), жывой бел. мовы (з камісіямі па складанні слоўніка жывой бел. мовы, дыялекталагічнай па вывучэнні бел. літ. мовы; у складзе кафедры — Ін-т навук. мовы), гісторыі бел. л-ры (з камісіяй па выданні твораў бел. пісьменнікаў), агульнай гісторыі, гісторыі Беларусі (з камісіямі па вывучэнні грамадскага руху на Беларусі, гісторыі гарадоў і краін Беларусі, гісторыі асветы на Беларусі), гісторыі бел. права (з археаграфічнай камісіяй), гісторыі нар. гасп. Беларусі, археалогіі Беларусі, этнаграфіі Беларусі (з фальклорнай камісіяй), гісторыі Літвы, глебазнаўства, батанікі (з бат. камісіяй і Бат. садам каля Віцебска), заалогіі (з заал. музеем); геаграфіі (з камісіямі геаграфіі і картаграфіі, па складанні геагр. слоўніка Беларусі), хіміі (з Цэнтр. хім. лабараторыяй), антрапалогіі (з лабараторыяй вышэйшай перв. дзейнасці і антрапалагічным кабінетам), біялогіі (з лабараторыяй эксперым. біялогіі), Ін-т бел. мастацтва (з камісіямі па вывучэнні гісторыі бел. мастацтва, бел. тэатра, бел. песні і музыкі; з музеем бел. мастацтва), геал. ін-т (з секцыяй рэгіянальнай геалогіі); працавалі камісіі: бібліяграфічная, вайскова-тэрміналагічная, па вывучэнні Зах. Беларусі, па вывучэнні культуры латышоў, па вывучэнні прыродных прадукцыйных сіл Беларусі, па вывучэнні прамысловасці, па вывучэнні хатніх рамёстваў, па вывучэнні кааперацыі; яўр. і польскі нац. сектары (з камісіямі). У сістэму Інбелкульта ўваходзілі таксама Цэнтр. бюро краязнаўства, навук. т-ва па вывучэнні Беларусі (пры Бел. с.-г. акадэміі); б-ка, друкарня. Такая структура Інбелкульта з невял. зменамі заставалася да 1.1.1929, калі ён быў пераўтвораны ў АН БССР. У Інбелкульце працавала 115 чал. на (27.4.1928). У ліку першых акадэмікаў АН БССР, яе заснавальнікаў правадз. чл. Інбелкульта У. І. Пічэта, І. Д. Луцэвіч (Я. Купала), К. М. Міцкевіч (Я. Колас), М. Ф. Бліадухо, С. Я. Вальфсон, Г. І. Гарэцкі, З. Хв. Жылуновіч (Ц. Гартны), М. М. Дурнаво, І. І. Замоцін, У. М. Ігнатоўскі, С. Ю. Матулайціс, І. А. Пятровіч. Выдадзены працы: «Беларуска-расійскі слоўнік» М. Байкова і С. Некрашэвіча (1925), «Чатырохсотлецце беларускага друку» (1926), «Сацыялістычны рух на Беларусі ў пракламацыях 1905 года» (1927), «Беларуская этнаграфія ў дослядах і матэрыялах» (кн. 1—5, 1926—28), «Матэрыялы да вывучэння флоры і фауны Беларусі» (т. 1—2, 1927—28), «Спроба лінгвістычнай геаграфіі Беларусі» П. А. Бузука (ч. 1, в. 1, 1928), «Беларускі архіў» (т. 1—2, 1927—28), «Працы і матэрыялы да гісторыі і археалогіі Беларусі» (кн. 1—3, 1926—27); выдавау «Запіскі аддзела гуманітарных навук» (кн. 2—6, 1928), час. «Наш край»; выйшлі «Працы першай Усебеларускай глебазнаўчай канферэнцыі. 16—17 крас. 1924» (1926) і інш.

У. У. Грамовіч. Мінск.

ІНСТЫТУТ ГЕАХІМІІ І ГЕАФІЗІКІ Акадэміі навук БССР, навукова-даследчая ўстанова, якая распрацоўвае тэарэт. і практ. пытанні вывучэння зямной кары і верхняй мантыі тэрыторыі рэспублікі і сумежных рэгіёнаў.

Арганізаваны ў 1971 на базе Лабараторыі геахім. праблем (з 1957) і Плешчаніцкай геафіз. станцыі АН БССР (з 1960), якія да 1963 уваходзілі ў склад Ін-та геал. навук АН БССР. Аддзелы: літалогіі і геахіміі глыбінных зон; літалогіі і геахіміі гіпергенезу (з лабараторыяй эксперым. геахіміі); біягеахіміі (з лабараторыяй геахіміі ландшафту); гідрагеахіміі падземных водаў і геатэрміі (з лабараторыяй гідрагеахіміі падземных водаў і поравых растворaў); палеагеаграфіі антрапагену; фізікі Зямлі (з геафіз. абсерваторыяй у г. п. Плешчаніцы); навук.-тэхн. інфармацыі; лабараторыя фізіка-хім. метадаў. Аспірантура з 1964. Аб'яднаны савет Ін-та геахіміі і геафізікі і *Геалагаразведачнага беларускага навукова-даследчага інстытута* Упраўлення геалогіі пры СМ БССР прымае да абароны канд. дысертацыі па спецыяльнасцях: геалогія, гідрагеалогія, геахімія, літалогія, мінералогія, петраграфія. У інстытуце працуюць акадэмікі АН БССР Г. В. Багамолаў, Г. І. Гарэцкі, А. С. Махнач. Дырэктар акадэмік АН БССР К. І. Лукашоў (з 1971).

Асн. кірункі навук. даследаванняў: літалогія і геахімія глыбінных і прыпаверхневых зон зямной кары і іх роля ў фарміраванні і размяшчэнні карысных выкапняў; гідрагеахімія падземных водаў і поравых растворaў; палеагеаграфія і палеагеахімія антрапагену; геафіз. вывучэнне глыбінных зон зямной кары і іх сувязь з верхнімі структурнымі ярусамі; геатэрмія глыбінных зон; узаемасувязь геафіз. і космафіз. працэсаў.

Лабараторыяй геахім. праблем выдадзены працы: «Нарысы па геахіміі гіпергенезу» К. І. Лукашова (1963), «Геахімічныя паводзіны элементаў у гіпергенным цыкле міграцыі» К. І. Лукашова (1964), «Падземныя воды і іх вывучэнне» Г. В. Багамолава і А. І. Сіліна-Бякчурына (1966), «Геахімічная характарыстыка літагенезу і ландшафтаў Беларускага Палесся» (1966), «Геахімічныя пошукі элементаў у зоне гіпергенезу» К. І. Лукашова і В. К. Лукашова (кн. 1—2, 1967), «Геахімічная правінцыі покрыўных адкладаў БССР» (1969), «Будова і фізіка глыбінных нетраў Заходняга рэгіёну СССР» (1969), «Нафта Беларусі» К. І. Лукашова, В. А. Лапуця, Р. Я. Семячкі і М. І. Буялава (1969), «Ступчатыя гліны Беларусі» Н. В. Зайцавай (1969), «Геахімія, фарміраванне і распаўсюджванне ёдабромных водаў» А. В. Кудзельскага і М. Ф. Казлова (1970), «Геахімія чацвярцічнага літагенезу» В. К. Лукашова (1970), «Хімічныя элементы ў глебах» К. І. Лукашова і Н. Н. Петуховай (1970), «Геахімічныя асаблівасці марэннага літагенезу» К. І. Лукашова і С. Дз. Астапавай (1971).

У. А. Кузняцоў. Мінск.

ІНСТЫТУТ ГЕНЕТЫКІ І ЦЫТАЛОГІІ Акадэміі навук БССР, навукова-даследчая ўстанова, якая распрацоўвае тэарэт. і селекцыйна-метадычныя пытанні генетыкі.

Засн. ў 1965 у Мінску на базе Аддзела генетыкі і цыталогіі АН БССР, які ў 1963 вылучаны з Ін-та біялогіі АН БССР. Лабараторыі: гетэрозісу і генетыкі колькасных адзнак; тэарэт. генетыкі; эксперым. поліплаідыі; генетыкі мікраарганізмаў; эксперым. мутагенезу раслін; нехрамасомнай спадчыннасці, папуляцыйнай генетыкі раслін. У сістэме ін-та — біял. доследная станцыя (ст. Сцяпянка Мінскага р-на). Аспірантура з 1965. У ін-це працавалі акад. АН БССР А. Р. Жэбрак, чл.-кар. АН БССР А. М. Іпацьеў; працуюць акад. АН БССР П. Ф. Раманкі, чл.-кар. АН БССР У. Я. Борматаў. З 1965 да 1971 дырэктар ін-та акад. АН БССР М. В. Турбін, з 1971 доктар біялагічных навук Л. У. Хатылёва.

Асн. кірункі навук. даследаванняў: генетычныя асновы гетэрозісу і цытаплазматычнай стэрыльнасці (ЦМС); заканамернасці атрымання ў спадчыну колькасных адзнак; эксперым. поліплаідыя; хім. і радыяцыйны мутагенез; генетыка пухліннага росту. Выпікі навук. даследаванняў: прапанавана новая генетычная канцэпцыя гетэрозісу, заснаваная на тэорыі генетычнага балансу; арыгінальная праграма рацыпрокснай селекцыі; праведзены тэарэт. аналіз палікроснага скрыжавання для стварэння генетычна збалансаваных папуляцый с.-г. раслін; распрацавана тэарэт. мадэль узаемадзеяння ядзерных генаў і плазмагенаў пры фарміраванні ЦМС; устаноўлена, што павышэнне ўраджайнасці трыплоідных гібрыдаў звязана пераважна са з'явай гетэрозісу і атрыманы практычна каштоўныя гетэрозісныя трыплоіды цукр. буракоў; распрацавана методыка павышэння частаты праяў мутантных змен; устаноўлена залежнасць радыеўстойлівасці раслін ад гетэрозіснага стану арганізма; выяўлены новыя групы антымутагенаў і ахоўных рэчываў; вызначаны адрозненні ў ахоўным эфекце ў залежнасці ад віду і энергіі крыніцы апрамянення; атрыманы дадзеныя для тлумачэння механізма ракавай анергіі (здольнасці генетычна змененых пухлінных клетак пераадольваць бар'ер тканкавай несумяшчальнасці); упершыню вынайдзены генетычны эфект прамежкавых нейтронаў.

Выдадзены працы: «Селекцыя гібрыднай кукурузы» Л. У. Хатылёвай (1965), «Біялагічная статыстыка» П. Ф. Раманкага (2 выд., 1967), «Цытаплазматычная мужчынская стэрыльнасць у раслін» Г. М. Палілавай (1969), «Імунагенетычныя асновы ракавай анергіі» Г. В. Краскоўскага (1970); праблемна-тэматычныя зборнікі: «Паліплоідныя цукровыя буракі» (1966), «Эксперыментальны мутагенез» (1967), «Пытанні матэматычнай генетыкі» (1969), «Пытанні радыебіялогіі» (1969), «Пытанні генетыкі і селекцыі» (1970), «Пытанні медыцынскай генетыкі і генетыкі чалавека» (1971).

Л. У. Хатылёва. Мінск.

ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ Акадэміі навук БССР, навукова-даследчая ўстанова, якая распрацоўвае пытанні гісторыі беларускага народа.

Арганізаваны ў 1931 на базе Аддзела гісторыі Аддзялення гуманітарных навук АН БССР. Сектары (1971): археалогіі, гісторыі Беларусі дасавецкага грамадства, гісторыі Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялізму, гісторыі Вял. Айч. вайны, гісторыі камуністычнага буд-ва, гісторыі сучаснага сацыялістычнага краіны, збору і публікацыі дакументаў і мемуараў. Аспірантура з 1934. Савет па гістар. навуках і мастацтвазнаўстве Аддзялення грамадскіх навук АН БССР прымае да абароны канд. і доктарскія дысертацыі па гістар. навуках і мастацтвазнаўстве. У розны час ін-т узначальвалі акадэмікі АН БССР М. М. Нікольскі, І. С. Крачанка, В. К. Шчарбакоў, чл.-кар. АН БССР С. Х. Агурскі, Н. В. Каменская; працавалі акад. АН БССР У. М. Перцаў. Дырэктар чл.-кар. АН БССР І. М. Ігнаценка (з 1969).

Асн. кірункі навук. даследаванняў: праблемы археалогіі, гісторыі Беларусі дасав. гр-ва; Вял. Кастр. сацыяліст. рэвалюцыя і грамадз. вайна на Беларусі; гісторыя буд-ва сацыялізма і камунізма; гісторыя рабочага класа і калгаснага сялянства рэспублікі; барацьба бел. народа супраць ням.-фаш. захопнікаў у Айч. вайну; сувязі БССР з братнімі рэспублікамі Сав. Саюза і краінамі сацыяліст. лагера.

Выдадзены працы: «Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі» (т. 1—4, Мн., 1936—54; назва т. 1: Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах, т. 4: З гісторыі станаўлення Савецкай улады ў Беларусі і ўтварэння БССР), «Рэвалюцыйны рух у Беларусі 1905—1907 гг. Дакументы і матэрыялы» (1955), «Беларусь у эпоху феадалізму» (т. 1—3, 1959—61), «Гісторыя Беларускай ССР» (т. 1—2, 2 выд., 1961), «Гісторыя Мінска» (1957, 1967); «Першыя сацыялістычныя пераўтварэнні ў Беларусі» Н. В. Каменскай (1957), «Беларускі народ у гады Вялікай Айчыннай вайны» І. С. Крачанкі і А. І. Залескага (1959), «Рабочы клас БССР у пасляваенныя гады» І. Я. Марчанкі (1960), «Аграрнае пытанне і сялянскі рух у Беларусі ў рэвалюцыі 1905—1907 гг.» К. І. Шабуні (1962), «Полацк. Гістарычны нарыс» (1962), «Сельская гаспадарка Беларусі ў першай палове XIX ст.» В. У. Чапко (1966), «Перамога Савецкай улады ў Беларусі» (1967), «Палеаліт Верхняга Падняпроўя» К. М. Палікарповіча (1968), «Супрацоўніцтва Беларускай ССР з сацыялістычнымі краінамі» С. Д. Вайтовіча, М. С. Вераб'я і В. С. Талстога (1970), «Нарысы па археалогіі Беларусі» (ч. 1, 1970) і інш.

І. М. Ігнаценка. Мінск.

ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ ПАРТЫІ ПРЫ ЦК КПБ, філіял *Інстытута марксізма-ленінізма пры ЦК КПСС*; партыйная навукова-даследчая ўстанова. Гал. задачы ін-та — прапаганда ідэйнай спадчыны класікаў марксізма-ленінізма, распрацоўка гісторыі КПБ, пытанняў парт. буд-ва, праблем ленінскай нац. палітыкі і інтэрнацыянальнага выхавання, выкрыццё антыкамунізму, правага і «левага» апартунізму, каардынацыя н.-д. работы ў галіне гісторыка-парт. навукі.

Папярэднікам ін-та была Камісія (Гістпарт), засн. пастановай ЦБ КП(б)Б 10.6.1921 для збору і вывучэння матэрыялаў па гісторыі КП(б)Б і рэвалюц. руху на Беларусі. Пастановай ЦК КП(б)Б 17.5.1929 Гістпарт пераўтвораны ў НДІ, які ў 1929—47 наз. Ін-там гісторыі партыі і Кастр. рэвалюцыі пры ЦК КП(б)Б. Сектары: гісторыі партыі, парт. буд-ва, перакладу. Пры ін-це партархіў, б-ка, *Дом-музей I з'езду РСДРП*. Прымае да абароны канд. дысертацыі па гістар. навуках. Пры ін-це Бел. рэсп. савет па каардынацыі навук. распрацоўкі гісторыі КПСС і КПБ. У розны час ін-т узначальвалі бел. вучоныя В. А. Сярбента, П. В. Саевіч, С. У. Пасэ, І. С. Чымбург, М. М. Мяшкоў, Н. В. Каменская, І. М. Ігнаценка і інш. Дырэктар ін-та канд. філас. н. М. Ф. Капіч (з 1969).

Ін-там перакладзены і выдадзены на бел. мове творы К. Маркса, Ф. Энгельса, 42 т. твораў У. І. Леніна і інш. Выдадзены працы: «КП(б)Б у рэзалюцыях» (ч. 1, 1934); «Вальшавікі Беларусі ў першай рускай рэвалюцыі» (1955); «Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя ў Беларусі» (Дакументы і матэрыялы. т. 1—2, 1957; разам з Ін-там гісторыі АН БССР і Архіўным упраўленнем БССР); «У барацьбе за Кастрычнік у Беларусі і на Заходнім фронце» (1957); «Нарысы гісторыі Камуністычнай партыі Беларусі» (ч. 1—2, 1961—67); «Аб партыйным падполлі ў Мінску ў гады Вялікай Айчыннай вайны» (1961, разам з Ін-там гісторыі АН БССР); «Барацьба працоўных Заходняй Беларусі за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне і ўз'яднанне з БССР» (Дакументы і матэрыялы, т. 1, 1962; разам з Ін-там гісторыі АН БССР і Архіўным упраўленнем пры Савеце Міністраў БССР); «Хроніка важнейшых падзей гісторыі Камуністычнай партыі Беларусі» (ч. 1—2, 1962—70); «Злачынствы нямецка-фашысцкіх акупантаў у Беларусі» (1963, разам з Ін-там гісторыі АН БССР і Цэнтр. дзярж. архівам Кастр. рэвалюцыі і сацыяліст. буд-ва БССР); «Рэвалюцыйны шлях Кампартыі Заходняй Беларусі (1921—39 гг.)» (1966); «Усенародны партызанскі рух у Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны» (Дакументы і матэрыялы. т. 1, 1967; разам з Ін-там гісторыі АН БССР); «Пісьмы працоўных Беларусі У. І. Леніну» (2 выд., 1969); «Барацьба Кампартыі Беларусі за пабудову эканамічнага фундамента сацыялізма. 1926—1932»

М. В. Уласенкі (1970); «У барацьбе за індустрыялізацыю» А. Т. Нятылькіна (1970); «У барацьбе і працы» (1970) і інш.

Літ.: Мешков Н. М. В Институте истории партии при ЦК КП Белоруссии, «Вопросы истории КПСС», 1959, № 4; Почанин С. З. Партийные архивы Белоруссии — документальная база истории КПБ, у кн.: Вопросы архивоведения и источниковедения в БССР, Мн., 1971. *М. Ф. Капіч.* Мінск.

ІНСТЫТУТ ЛЕ́НІНА ПРЫ ЦК ВКП(б), засн. ў 1923, у 1931 аб'яднаны з *Інстытутам Маркса і Энгельса* (ІМЭ) у адзіны Ін-т Маркса — Энгельса — Леніна пры ЦК ВКП(б) (ІМЭЛ), які ў 1956 перайменаваны ў *Інстытут марксізма-ленінізма пры ЦК КПСС* (ІМЛ).

ІНСТЫТУТ ЛІТАРАТУРЫ імя Янкі Купалы Акадэміі навук БССР, навукова-даследчая ўстанова, якая распрацоўвае праблемы гісторыі і тэорыі бел. л-ры, каардынуе даследчую работу па літаратуразнаўстве ў рэспубліцы.

Арганізаваны ў 1931 у Мінску ў складзе АН БССР. У гады Айч. вайны (1941—43) ін-т не працаваў. Да 1951 наз. Ін-там мовы, літаратуры і мастацтва; да 1957 — Ін-там літаратуры і мастацтва. Імя Я. Купалы прысвоена ў 1957. Сектары: бел. сав. л-ры, бел. дакастрычніцкай л-ры і тэксталогіі, тэорыі л-ры. Аспірантура з 1931. Аб'яднаны вучоны савет Ін-та літаратуры і Ін-та мовазнаўства АН БССР прымае да абароны канд. і доктарскія дысертацыі па філал. навуках. Дырэктары ін-та акад. АН БССР М. Ц. Лынькоў (1943—46), В. В. Барысенка (1937—41, з 1946).

Асн. кірункі навук. даследаванняў: заканамернасці развіцця бел. сав. л-ры на шляхах сацыяліст. рэалізму; заканамернасці развіцця бел. дакастр. л-ры; пытанні марксісцка-ленінскай тэорыі л-ры; узаемасувязі і ўзаемадзеянне бел. л-ры з іншымі літаратурамі. Ін-т рыхтуе і выдае навукова-каменціраваныя зборы твораў класікаў бел. л-ры і помнікі бел. пісьменнасці.

Працы: «Гісторыя беларускай савецкай літаратуры» (т. 1—2, 1965—66), «Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры» (т. 1—2, 1968—69), «Садружнасць літаратур» (1968), «Прадмовы і пасляслоўі Ф. Скарыны» (1969), «У. І. Ленін і літаратура» (1970), «Старонкі літаратурных сувязей» (1970), «Сучасная беларуская паэзія» (1970), «Беларуская савецкая проза. Апавяданне і нарыс» (1971), «Беларуская савецкая проза. Раман і аповесць» (1971); манаграфіі: «Францішак Багушэвіч і праблема рэалізму ў беларускай літаратуры XIX стагоддзя» В. В. Барысенкі (1957), «Беларуская савецкая проза» Ю. С. Пшыркова (1960), «Шляхі развіцця беларускай савецкай літаратуры 20—30 гг.» Н. С. Перкіна (1960), «Беларускі раман» А. М. Адамовіча (1961), «Ля вытокаў сацыялістычнага рэалізму» В. У. Івашына (1963), «Праблемы сучаснай беларускай прозы» П. К. Дзюбайлы, В. П. Жураўлёва і М. П. Луферава (1967), «Фальклорныя традыцыі ў беларускай дакастрычніцкай паэзіі» М. М. Грынчыка (1969), «Беларуская дзіцячая літаратура (1917—1967)» Э. С. Гурэвіч (1970), «Янка Купала і беларуская паэзія» М. Р. Яроша (1971), «Тэксталогія твораў Янкі Купалы» Р. І. Гульман (1971). Ін-т выдаў зборы твораў Янкі Купалы ў 6 т. (1961—63), Якуба Коласа ў 12 т. (1961—64), Максіма Багдановіча ў 2 т. (1968), навук. зб. «Беларуская літаратура. Даследаванні і публікацыі» (в. 1—5; 1958—63), зб. тэкстаў «Беларуская дакастрычніцкая проза» (1965), «Беларуская дакастрычніцкая паэзія» (1967) і інш.

А. П. Парэпка. Мінск.

ІНСТЫТУТ МА́РКСА І ЭНГЕЛЬСА (ІМЭ), засн. ў 1921 у Маскве. У 1931 аб'яднаны з *Інстытутам Леніна пры ЦК ВКП(б)* у адзіны Ін-т Маркса — Энгельса — Леніна пры ЦК ВКП(б) (ІМЭЛ), які ў 1956 перайменаваны ў *Інстытут марксізма-ленінізма пры ЦК КПСС* (ІМЛ).

ІНСТЫТУТ МА́РКСА — ЭНГЕЛЬСА — ЛЕ́НІНА ПРЫ ЦК ВКП(б) (ІМЭЛ), назва *Інстытута марксізма-ленінізма пры ЦК КПСС* (ІМЛ) у 1931—56.

ІНСТЫТУТ МАРКСІЗМА-ЛЕНІНІЗМА ПРЫ ЦК КПСС (ІМЛ), цэнтральная партыйная навукова-даследчая ўстанова, асн. задачамі якой з'яўляюцца: збіранне, зберaганне і публікацыя літ. спадчыны К. Маркса, Ф. Энгельса і У. І. Леніна, падрыхтоўка і выданне іх біяграфій; збіранне, зберaганне і публікацыя дакументаў цэнтр. партыйных устаноў і твораў выдатных дзеячаў партыі; навук. распрацоўка гісторыі КПСС, актуальных праблем марксізма-ленінізма, тэорыі навук. камунізма, гісторыі міжнар. камуніст. руху. У 1921 арганізаваны Ін-т К. Маркса і Ф. Энгельса, у 1923 — Ін-т Леніна, у 1931 яны аб'яднаны ў Ін-т Маркса — Энгельса — Леніна пры ЦК ВКП(б) (ІМЭЛ). 28.3.1956 перайменаваны ў Ін-т марксізма-ленінізма пры ЦК КПСС.

Аддзелы: твораў К. Маркса, Ф. Энгельса і У. І. Леніна; гісторыі КПСС; парт. буд-ва; навук. камунізма; гісторыі міжнар. камуніст. руху; філіялаў і каардынацыі н.-д. работы; Цэнтр. парт. архіў. Пры ін-це музей К. Маркса і Ф. Энгельса, б-ка. У цеснай сувязі з ін-там — Цэнтр. музей У. І. Леніна. Ін-т мае філіялы ў Маскве, Ленінградзе, ва ўсіх саюзных рэспубліках; у БССР філіял ІМЛ — *Інстытут гісторыі партыі пры ЦК КПБ.* Ін-т скончыў 1-е выданне твораў К. Маркса і Ф. Энгельса, 4 выданні твораў У. І. Леніна. Працягвае выдаваць 2-е выд. твораў К. Маркса і Ф. Энгельса, 5-е выд. твораў У. І. Леніна, архіў Маркса і Энгельса. Выдадзена 37 Ленінскіх зборнікаў, выбраныя творы К. Маркса і Ф. Энгельса ў 2 тамах, выбраныя творы У. І. Леніна ў 2 і 3 тамах, тэматычныя зборнікі па найбольш важных праблемах марксізма-ленінізма, навук. біяграфіі К. Маркса, Ф. Энгельса, У. І. Леніна (выйшла 4 выданні). Апублікаваў 7 выданняў і пачаў 8-е выд. (т. 1, 1970) зб. «КПСС у рэзалюцыях і рашэннях з'ездаў, канферэнцый і пленумаў ЦК», шэраг пратаколаў і стэнаграм з'ездаў і канферэнцый партыі, дакументальныя зборнікі па гісторыі КПСС, выдаецца гісторыя КПСС у 6 тамах, выбраныя творы Ф. Э. Дзяржынскага, М. І. Калініна, Р. К. Арджанікідзе, С. Г. Шаўмяна і інш.; скончыў выпуск «Гісторыі грамадзянскай вайны ў СССР» у 5 тамах, «Гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Савецкага Саюза 1941—1945» у 6 тамах і інш. Выдае час. «Вопросы истории КПСС» (з 1957). У 1971 узнаг. ордэнам Леніна.

Г. Дз. Абічкін. Масква.

ІНСТЫТУТ МАСТАЦТВАЗНА́ЎСТВА, ЭТНАГРА́ФІІ І ФАЛЬКЛО́РУ Акадэміі навук БССР, навукова-даследчая ўстанова, якая займаецца вывучэннем мастацтва, помнікаў гісторыі і культуры Беларусі, народнай творчасці і быту беларускага народа.

Арганізаваны ў 1957 на базе сектара этнаграфіі і фальклору Ін-та гісторыі АН БССР і сектара мастацтва Ін-та л-ры АН БССР. Сектары: тэатра і кіно, выяўл. мастацтва, этнаграфіі, фальклору, музыкі, збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Аспірантура з 1957. Савет па гістар. навуках і мастацтвазнаўстве Аддзялення грамадскіх навук АН БССР прымае да абароны канд. дысертацыі па мастацтвазнаўстве. З 1957 да 1969 дырэктар ін-та акад. АН БССР П. Ф. Глебка, з 1969 д-р гістар. н. В. К. Бандарчык.

Асн. кірункі навук. даследаванняў: вывучэнне заканамернасцей развіцця бел. тэатра, кіно, музыкі, выяўленчага і прыкладнога мастацтва, быту, вуснапаэт. творчасці бел. народа, помнікаў гісторыі і культуры Беларусі.

Выдадзены працы: «Беларускі тэатр. Нарыс гісторыі» У. І. Няфёда (1959), «Нарысы па гісторыі выяўленчага мастацтва Савецкай Беларусі» М. С. Кацара (1960), «Сучасны беларускі тэатр» У. І. Няфёда (1961), «Беларускі фальклор Вялікай Айчыннай вайны» (1961), «Народнасць савецкага мастацтва і беларуская музыка» А. Б. Ладыгінай (1961), «Беларускі музычны тэатр» Б. С. Смольскага (1963), «Антырэлігійныя матывы ў беларускім фальклоры» А. С. Фядосіка (1963), «Сучасны беларускі фальклор» І. В. Гутарава (1963), «Ладавыя асновы беларускай народнай музыкі» В. І. Ялатава (1964), «Гісторыя беларускай этнаграфіі XIX ст.» В. К. Бандарчыка (1964), «Беларусы» (у кн.: Народы Еўрапейскай часткі СССР, т. 1, М., 1964), «У. І. Ленін у беларускай народнай творчасці» (1967), «Беларуская народная вуснапаэтычная творчасць» (1967), «Беларусы» М. Я. Грынблата (1968), «Матэрыяльная культура беларусаў» Л. А. Малчанавай (1968), «У тыле ворага» А. І. Залескага (1969), «Ад традыцыйнага фальклору да рэвалюцыйнай паэзіі» К. П. Кабашнікава (1969), «Гісторыя беларускага кіно» (т. 1—2, 1969—70), «Манументальны летапіс эпохі» І. М. Ялатамцавай (1969), «Вобраз У. І. Леніна ў беларускім мастацтве» (1970), «Гісторыя беларускай этнаграфіі. Пачатак XX ст.» В. К. Бандарчыка (1970), «Трапным народным словам» А. С. Фядосіка (1971). Пачаў выданне бел. фальклору ў 30 т. (выйшлі «Песні савецкага часу», 1970, «Казкі пра жывёл і чарадзейныя казкі», 1971, «Радзінная паэзія», 1971).

В. К. Бандарчык. Мінск.

ІНСТЫТУТ МАТЭМА́ТЫКІ Акадэміі навук БССР, навукова-даследчая ўстанова, якая распрацоўвае пытанні тэарэт. і прыкладной матэматыкі.

Засн. ў 1959 у Мінску на базе лабараторый матэм. профілю Ін-та фізікі і матэматыкі АН БССР (з 1955) як Ін-т матэматыкі і вылічальнай тэхнікі АН БССР. У 1965 перайменаваны ў Ін-т матэматыкі (лабараторыі тэхн. профілю ўвайшлі ў склад Ін-та тэхн. кібернетыкі АН БССР). Лабараторыі: дыферэнцыяльных ураўненняў, вылічальнай матэматыкі, алгебры, тэорыі лікаў, прыкладной матэматыкі і механікі, матэм. фізікі, канечных груп. У сістэме ін-та — вылічальны цэнтр, у складзе якога 8 лабараторый. Аспірантура з 1959. Аб'яднаны вучоны савет пры Аддзяленні фізіка-матэм. навук АН БССР прымае да абароны канд. і докт. дысертацыі па фіз.-матэм. навуках. У ін-це працаваў акад. АН БССР Я. А. Барбашын; працуюць акад. АН БССР У. І. Крылоў, Дз. А. Супруненка, С. А. Чуніхін, чл.-кар. АН БССР У. Г. Спрынджук. Дырэктар акад. АН БССР М. П. Яругін (з 1959).

Асн. кірункі навук. даследаванняў: звычайныя дыферэнцыяльныя ўраўненні, вылічальная матэматыка, алгебра, тэорыя лікаў, тэорыя аўтам. кіравання, ураўненні матэм. фізікі, даследаванне аперацый, матэм. забеспячэнне электронных вылічальных машын. Вынікі навук. даследаванняў: пабудавана агульная тэорыя вырашальных матрычных груп над адвольным полем; вырашана праблема Малера і тым самым поўнасцю выканана задача набліжэння амаль усіх лікаў алгебраічнымі лікамі абмежаванай ступені; створаны новыя метады даследавання ў тэорыі ўстойлівасці лінейных і нелінейных дыферэнцыяльных ураўненняў і ў аналітычнай тэорыі дыферэнцыяльных ураўненняў; прапанаваны новыя метады пабудовы функцый Ляпунова і атрыманы ацэнкі вобласці прыцяжэння складаных дынамічных сістэм; атрыманы рашэнні задач матэм. тэорыі дыфракцыі хваляў на перашкодах з двух целаў правільнай геам. формы; распрацаваны бібліятэка праграм і транслятары з алгарытмічных моў АЛГОЛ-60 і АЛГАМС для вылічальнай машыны «Мінск-22» і яе мадыфікацый.

Выдадзены працы: «Прыбліжанае вылічэнне інтэгралаў» У. І. Крылова (1967), «Лінейныя сістэмы звычайных дыферэнцыяльных ураўненняў...» М. П. Яругіна (1963), «Перастановачныя матрыцы» Дз. А. Супруненкі і Р. І. Тышкевіч (1966), «Даведачная кніга па лікавым інтэграванні» У. І. Крылова і Л. Т. Шульгіной (1966), «Праблема Малера ў метрычнай тэорыі лікаў» У. Г. Спрынджука (1967), «Дыфракцыя электрамагнітных хваляў на двух целах» Я. А. Іванова (1968), «Дынамічныя сістэмы з цыліндрычнай фазавай прасторай» Я. А. Барбашына і В. А. Табуевай (1969), «Кніга для чытання па агульным курсе дыферэнцыяльных ураўненняў» М. П. Яругіна (1970) і інш. Ін-т выдае тэматычныя зб. па матэм. забеспячэнні электронных вылічальных машын серыі «Мінск».

А. С. Мяцельскі. Мінск.

ІНСТЫТУТ МЕХА́НІКІ МЕТАЛАПАЛІМЕ́РНЫХ СІСТЭ́М Акадэміі навук БССР, навукова-даследчая ўстанова, якая распрацоўвае тэарэт. і практ. пытанні стварэння і выкарыстання металапалімерных матэрыялаў.

Засн. ў Гомелі ў 1969 на базе Аддзела механікі палімераў АН БССР (з 1964). Лабараторыі: тэарэт. асноў стварэння металапалімерных матэрыялаў; структурнай механікі і трэння палімераў; металапалімерных канструкцый; металапалімерных і палімерных пакрыццяў; зносаўстойлівасці і надзейнасці металапалімераў; спец. канструктар. бюро; патэнтна-ліцэнз. аддзел. Аспірантура з 1964. Дырэктар чл.-кар. АН БССР У. А. Белы (з 1969).

Асн. кірункі навук. даследаванняў: распрацоўка навук. асноў фарміравання металапалімерных матэрыялаў, даследаванне фіз.-хім. працэсаў на мяжы метал — палімер, вывучэнне ўзаемасувязі надмалекулярных структур і фіз.-мех. уласцівасцей палімераў, даследаванне даўгавечнасці і надзейнасці металапалімерных матэрыялаў і канструкцый, вывучэнне працэсаў трэння і зносу металапалімерных пар трэння, стварэнне інж. метадаў разліку і канструявання металапалімерных вырабаў. Вынікі навук. даследаванняў: распрацаваны новы метад і абсталяванне для нанясення танкаслойных палімерных пакрыццяў, новыя матэрыялы, прылады і канструкцыі дэталяў з палімераў, створаны прылады для даследавання дэфармацыйнасці надмалекулярных структур палімераў. На аснове выкананых навук. работ ін-т атрымаў больш як 150 аўтарскіх пасведчанняў у СССР і на асобныя вынаходствы — патэнты ў капіталіст. краінах.

Выдадзены працы: «Зубчастыя колы з пластмас» У. А. Белага, А. І. Свірыдзёнка і С. В. Шчарбакова (1965); «Палімеры ў прамысловасці» (1968); «Аб прыродзе трэння цвёрдых целаў» (1971) і інш.

У. А. Белы. Гомель.

ІНСТЫТУТ МОВАЗНА́ЎСТВА імя Якуба Коласа Акадэміі навук БССР, навукова-даследчая ўстанова, якая распрацоўвае тэарэт. пытанні беларускага, славянскага і агульнага мовазнаўства, каардынуе даследчую работу па мове ў рэспубліцы.

Засн. ў 1931 у Мінску на базе секцыі бел. мовы, слоўнікавай, тэрміналагічнай і правапіснай камісій, якія да 1929 знаходзіліся ў складзе Ін-та бел. культуры, а з 1929 да 1931 у сістэме АН БССР. У перыяд Айч. вайны ін-т не функцыянаваў, за выключэннем слоўнікавай групы, якая працавала ў Маскве. У 1944—50 н.-д. праца ў галіне мовазнаўства ажыццяўлялася сектарам мовы Ін-та мовы, л-ры і мастацтва АН БССР. Як самастойная н.-д. ўстанова адноўлены ў 1951. Імя Якуба Коласа прысвоена ў 1956. Сектары: гісторыі мовы, дыялекталогіі, сучаснай бел. мовы, лексікалогіі і лексікаграфіі, агульнага і славянскага мовазнаўства; лабараторыя эксперым. фанетыкі. У 1951—56 ін-т узначальваў акад. К. К. Крапіва, у 1957 акад.

П. Ф. Глебка. З чэрв. 1957 дырэктар ін-та чл.-кар. АН БССР М. Р. Суднік. Аспірантура з 1931. Аб'яднаны вучоны савет Ін-та мовазнаўства і Ін-та літаратуры АН БССР прымае да абароны канд. і докт. дысертацыі па філал. навуках.

Асн. кірункі навук. даследаванняў: вывучэнне структуры і заканамернасцей развіцця сучаснай бел. мовы (літ. і дыялектнай); вырашэнне тэарэт. і практ. пытанняў рэгулявання нормаў бел. літ. мовы ў розных яе сферах (марфал., лексічнай, акцэнталагічнай і інш.); асвятленне працэсаў фарміравання і развіцця бел. мовы на аснове дадзеных яе ўнут. і знешняй гісторыі; даследаванне бел.-рус., бел.-ўкр., бел.-польск. і інш. міжмоўных кантактаў.

Выдадзены працы: «Беларуская граматыка. Марфалогія» (1936), «Курс сучаснай беларускай мовы (Фанетыка, марфалогія, лексіка)» (1940), «Руска-беларускі слоўнік» пад рэдакцыяй Я. Коласа, К. Крапівы і П. Глебкі (1953), «Марфалогія дзеяслова ў беларускай мове» Ю. Ф. Мацкевіч (1959), «Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» (1959), «Беларуска-рускі слоўнік» пад рэдакцыяй К. Крапівы (1962), «Граматыка беларускай мовы» (т. 1—2, 1962—66), «Дыялекталагічны атлас беларускай мовы» (1963), «Беларуская мова» (у кн.: Мовы народаў СССР, т. 1, М., 1966) М. В. Бірылы, М. Г. Булахава і М. Р. Судніка, «Гісторыя беларускай літаратурнай мовы» (т. 1, А. І. Жураўскі, 1967; т. 2, І. І. Крамко, А. К. Юрэвіч і А. І. Яновіч, 1968), «Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак» (1968; 1969, карты), «Беларуская антрапанімія» М. В. Бірылы (т. 1—2, 1966—69), «Ненацiскны вакалізм народных гаворак Беларусі» Н. Т. Вайтовіч (1968), «Славянская і індаеўрапейская акамадацыя» В. У. Мартынава (1968), «Сінтаксіс займенных клітык у паўднёваславянскіх мовах» Г. А. Цыхуна (1968), «Фаналагічная сістэма беларускай літаратурнай мовы» А. І. Падлужнага (1969), «Беларуска-ўкраінскія пісьмова-моўныя сувязі» У. В. Анічэнкі (1969), «Краёвы слоўнік усходняй Магілёўшчыны» І. К. Бялькевіча (1970), «Гістарычная лексікалогія беларускай мовы» (1970), «Руска-беларускі слоўнік грамадска-палітычнай тэрміналогіі» пад рэдакцыяй М. В. Бірылы і М. Р. Судніка (1970), «Гісторыя проціпастаўленняў па цвёрдасці і мяккасці ў беларускай мове» В. М. Чэкмана (1970). Ін-т выдаў «Працы» (в. 1—8, 1954—1961). *М. Р. Суднік.* Мінск.

ІНСТЫТУТ ПРАБЛЕ́М НАДЗЕ́ЙНАСЦІ І ДАЎГАВЕ́ЧНАСЦІ МАШЫН Акадэміі навук БССР, н.-д. ўстанова, якая распрацоўвае тэарэт. і практ. пытанні павышэння надзейнасці і даўгавечнасці вырабаў маш.-будавання.

Засн. ў Мінску ў 1957 пад назвай Ін-т машыназнаўства і аўтаматызацыі АН БССР. У 1963 перададзены ў Дзярж. камітэт па машынабудаванні пры Дзяржплане СССР, з 1965 у сістэме Мін-ва станкабуд. і інстр. прамысловасці СССР пад назвай Эксперым. НДІ машыназнаўства. З 1971 у сістэме АН БССР. Лабараторыі: кантролю і ацэнкі якасці металаапр. абсталявання; даследавання надзейнасці агрэгатных станкоў і аўтам. ліній; даследавання працаздольнасці гідраўлічнага абсталявання; структурнай надзейнасці і матэм. мадэлявання паскораных выпрабаванняў; фізічных працэсаў страты працаздольнасці; вывучэння і ацэнкі працаздольнасці вырабаў; фізіка-мех. асноў даўгавечнасці дэталяў машын; фізічных метадаў даследавання матэрыялаў; тэхнал. аспектаў павышэння надзейнасці вырабаў; вывучэння характару і віду нагружэння вырабаў; тэхн. дапамогі прадпрыемствам і канструктарскіх распрацовак; тэхніка-эканамічных даследаванняў павышэння якасці металаапр. абсталявання. Аспірантура з 1958. Дырэктар канд. тэхн. н. Ф. Я. Шчаслівенка (з 1965).

Асн. кірункі навук. даследаванняў: распрацоўка тэарэт. асноў і матэм. апарата надзейнасці і паскораных выпрабаванняў, метадаў і сродкаў тэхн. дыягностыкі і мадэлявання, рэкамендацый па выкарыстанні зносаўстойлівых і высокатрывалых матэрыялаў; распрацоўка і ўкараненне ў практыку машынабудавання метадаў і сродкаў выпрабавання вузлоў і машын на надзейнасць, рэгістрацыя параметраў надзейнасці і даўгавечнасці вырабаў; вывучэнне фіз. заканамернасцей працэсаў старэння, зносу, разбурэння дэталяў і разрэгулявання вузлоў і машын у цэлым, уплыў гэтых фактараў на іх надзейнасць; ацэнка эксплуатацыйнай (фактычнай) надзейнасці і даўгавечнасці машын, вызначэнне і вымярэнне паказчыкаў надзейнасці (аптымальных і нармаваных) і інш. Вынікі навук. даследаванняў: распрацаваны некат. пытанні агульнай тэорыі паскораных выпрабаванняў на надзейнасць дэталяў, элементаў, вузлоў і машын, метады і абсталяванне для выпрабаванняў на надзейнасць і даўгавечнасць шліфавальных, кансольна-фрэзерных, зубафрэзерных, такарна-шрубарэзных станкоў; вывучаны метады паскораных выпрабаванняў дэталяў, якія працуюць ва ўмовах цыклічнага нагружэння, метады аптымальнай эксплуатацыі станочных гідрасістэм і інш. Разам з Маскоўскім вышэйшым тэхн. вуч. імя Баўмана адпрацаваны метад вымярэння зносу пар трэння станкоў без іх разборкі з дапамогаю радыеактыўных індыкатараў.

Выдадзены працы: «Тэорыя даўгавечнасці і надзейнасці машын» В. М. Трэера (1964); «Надзейнасць і даўгавечнасць апораў рухомых сістэм прылад» Ю. В. Скарыніна (1965); «Надзейнасць і даўгавечнасць станочных сістэм» Г. І. Меламеда і Ф. Я. Шчаслівенкі (1967); «Паскораныя выпрабаванні зубчастых перадач на надзейнасць» У. Я. Цішкова і А. С. Собалева (1968) і інш. Ін-т выдае навук. зборнікі. *Ф. Я. Шчаслівенка.* Мінск.

ІНСТЫТУТ ТО́РФУ Акадэміі навук БССР, навукова-даследчая ўстанова, якая распрацоўвае тэарэт. пытанні генезісу торфу і сапрапеляў і іх комплекснага выкарыстання; праводзіць даследаванні хімічных, фізічных, фізіка-хімічных, біялагічных уласцівасцей торфу і прадуктаў яго перапрацоўкі.

Засн. ў 1934 у Мінску на базе эксперым. сектара Ін-та прамысловасці БССР (з 1929—30). Лабараторыі: тарфяных і сапрапелевых радовішчаў, генезісу торфу і сапрапеляў; фізікі торфу; фізіка-хіміі торфу; хіміка-біял. даследаванняў торфу; самаразагравання торфу; гумінавых і біялагічна актыўных рэчываў; комплекснага выкарыстання тарфяных радовішчаў Палесся. Эксперым. база «Дукора»; доследна-прамысловы з-д тарфянога воску ў Дукоры. Аспірантура з 1957. У ін-це ў розны час працавалі чл.-кар. АН БССР Ф. А. Апейка, І. Р. Блох, В. Г. Гарачкін, Б. К. Клімаў, У. Я. Ракоўскі і інш. бел. вучоныя; працуе чл.-кар. АН БССР П. І. Бялькевіч. Дырэктар д-р тэхн. н. М. С. Панкратаў (з 1963).

Асн. кірункі навук. даследаванняў: вывучэнне генезісу тарфяных і сапрапелевых радовішчаў, фізіка-хім. уласцівасцей торфу і сапрапеляў, працэсаў самаразагравання торфу пры хаванні, навук. асноў і тэхналогіі вытворчасці торфагумінавых угнаенняў, біялагічна актыўных рэчываў, бялковых кармоў, воску, напаўняльнікаў пластмас і інш.; меліярацыя лёгкіх глебаў суспензіяй торфу; распрацоўка шляхоў комплекснага выкарыстання тарфяных радовішчаў і торфу ў БССР, у т. л. Палесся. Вынікі навук. даследаванняў: распрацаваны новая тэхнал. схема сушкі торфу на брыкетных з-дах, паслойна-фрэзерны метад нарыхтоўкі торфу на ўгнаенне з выкарыстаннем машын УМПФ і бульдозераў з капіравальным прыстасаваннем.

Выдадзены працы: «Агульная хімічная тэхналогія торфу» У. Я. Ракоўскага (1949), «Тарфяны фонд Беларускай ССР», «Карта тарфянога фонду Беларускай ССР» (1953), «Хімія пірагенных працэсаў» У. Я. Ракоўскага, Ф. Л. Кагановіч і Я. А. Новічкавай (1959), «Тэарэтычныя асновы працэсу брыкетавання торфу» В. М. Навумовіча (1960), «Тарфяныя радовішчы Беларусі» А. П. Підоплічкі (1961), «Фізіка торфу» Н. С. Касцюка (1967), «Меліярацыя лёгкіх глебаў суспензіяй торфу» Ф. А. Малышава (1969). Выдае навук. зборнікі (з 1951). *В. В. Фадзеева.* Мінск.

ІНСТЫТУТ ТЭАТРА́ЛЬНАГА МАСТА́ЦТВА імя А. В. Луначарскага (рус. ГИТИС), вышэйшая навуч. ўстанова ў Маскве.

Засн. ў 1878 як муз.-драм. школа, з 1883 — Муз.-драм. вучылішча Маскоўскага філарманічнага т-ва. У 1918 рэарганізавана ў Муз.-драм. ін-т; з 1919 Дзярж. ін-т муз. драмы, у 1922 перайменаваны ў Ін-т тэатр. мастацтва. У 1925—31 існаваў як Цэнтр. тэхнікум тэатр. мастацтва, з 1931 зноў пераўтвораны ў ін-т. Імя Луначарскага прысвоена ў 1934.

Рыхтуе акцёраў драм. тэатра і кіно; акцёраў муз. камедыі; рэжысёраў балета, драмы; тэатразнаўцаў; спецыялістаў тэатральнай тэхнікі і па афармленні спектакля. Пры ін-це нац. акцёрскія студыі, вышэйшыя рэжысёрскія курсы. Ёсць аспірантура. Навучанне дзённае і завочнае. Прымае да абароны канд. і доктарскія дысертацыі па тэатразнаўстве. Сярод выхаванцаў ін-та нар. арт. СССР Я. М. Палосін, нар. арт. БССР З. І. Браварская, засл. артысты БССР І. К. Лакштанава, М. І. Кузьменка і інш.

ІНСТЫТУТ ТЭХНІ́ЧНАЙ КІБЕРНЕ́ТЫКІ Акадэміі навук БССР, навукова-даследчая ўстанова, якая распрацоўвае тэарэт. і практ. пытанні аўтаматызацыі працэсаў тэхн. падрыхтоўкі вытворчасці ў машынабудаванні. З'яўляецца міжгаліновай галаўной арг-цыяй СССР па выкарыстанні матэм. метадаў і вылічальнай тэхнікі для аўтаматызацыі працэсаў тэхн. падрыхтоўкі вытв. ў маш.-будаванні.

Засн. ў Мінску ў 1965 на базе лабараторый Ін-та матэматыкі і вылічальнай тэхнікі АН БССР (з 1959). Лабараторыі: тэорыі аўтаматызацыі праектавання, аўтаматызацыі аналізу і сінтэзу схем кіравання, аўтаматызаваных падсістэм тэхнал. праектавання, аўтаматызаваных падсістэм нарматыўных разлікаў падрыхтоўкі вытворчасці, аўтаматызацыі праектавання інструмент. аснасткі, чарцёжных аўтаматаў, перадачы інфармацыі, чытальных аўтаматаў і інш. Аспірантура з 1965. З 1965 да 1970 дырэктар ін-та чл.-кар. АН БССР Г. К. Гаранскі, з 1971 в. а. канд. тэхн. н. А. І. Семянкоў.

Асн. кірункі навук. даследаванняў: стварэнне тэорыі аўтаматызацыі канструявання і тэхнал. падрыхтоўкі вытворчасці ў машынабудаванні; даследаванні ў галіне стварэння спецыялізаваных тэхн. сродкаў аўтаматызаваных сістэм праектавання; аўтаматызацыя навук. даследаванняў. Вынікі навук. даследаванняў: распрацаваны асновы тэорыі аўтаматызаванага канструявання і тэхнал. праектавання ў машынабудаванні, распрацаваны метады, алгарытмы і праграмы аўтаматызаванага праектавання (дэталяў і вузлоў машын, тэхнал. працэсаў вырабу дэталяў, тэхнал. аснасткі), чарцёжна-графічны аўтамат «ІТЭКАН-2», апаратура перадачы інфармацыі і інш. На аснове выкананых работ ін-т атрымаў 50 аўтарскіх пасведчанняў на вынаходства.

Выдадзены працы: «Да тэорыі аўтаматызацыі інжынернай працы» Г. К. Гаранскага (1962); «Разлік рэжымаў рэзання пры дапамозе электронна-вылічальных машын» Г. К. Гаранскага (1963); «Гідраўлічныя і электрычныя схемы аўтаматызаваных станкоў» А. І. Дабралюбава (1965); «Сінтэз пераключальных схем» А. Ш. Блоха (1966); «Аўтаматызацыя спектральнага і карэляцыйнага аналізу» П. М. Чаголіна (1969); «Метады карыгіравання рабочых профіляў рэзальных інструментаў з выкарыстаннем ЭВМ» Б. І. Сініцына (1969); «Аўтаматызацыя тэхнічнага нарміравання работ на металарэзальных станках з дапамогай ЭВМ» Г. К. Гаранскага, Я. У. Уладзімірава і Л. М. Ламбіна (1970) і інш. Ін-т выдае ўсесаюзны навукова-тэхн. зб. «Вычислительная техника в машиностроении» (з 1965), б-ку алгарытмаў і праграм аўтаматызаванага праектавання. *Л. С. Ткачэнка.* Мінск.

ІНСТЫТУТ ФІЗІКА-АРГАНІ́ЧНАЙ ХІМІІ Акадэміі навук БССР, навукова-даследчая ўстанова, якая распрацоўвае тэарэт. і практ. пытанні арганічнай хіміі.

Засн. ў 1959 у Мінску на базе Ін-та хіміі АН БССР (з 1930). У складзе ін-та аддзел нафтахіміі, лабараторыі: арганічнага каталізу, тонкага арган. сінтэзу, тэрпенаў і смаляных кіслот, хіміі прыродных высокамалекулярных злучэнняў, элементаарган. злучэнняў, фізіка-хіміі акіслення, ізатопаў і інш. Аспірантура з 1959. Аб'яднаны вучоны савет ін-таў фізіка-арганічнай хіміі, агульнай і неарганічнай хіміі, торфу прымае да абароны канд. і доктарскія дысертацыі па хім. навуках. У ін-це працуюць акадэмікі АН БССР А. А. Ахрэм, Я. М. Павушкін, чл.-кар. АН БССР Ю. А. Альдэкоп, І. І. Бардышаў, М. І. Міцкевіч. Дырэктар акад. АН БССР М. С. Казлоў (з 1967).

Асн. кірункі навук. даследаванняў: 1) у галіне арган. каталізу вывучаецца сувязь паміж каталітычнай актыўнасцю, структурай і складам каталізатараў, механізм каталітычных рэакцый, каталітычны сінтэз, пераважна на аснове нафтавай сыравіны, розных арган. злучэнняў: манамераў, алігамераў, палімераў і інш. дапаможных рэчываў. 2) Даследаванне прыродных рэчываў: стэроідаў, антыбіётыкаў, смаляных кіслот, цэлюлозы; сінтэз біялагічна актыўных злучэнняў з адначасовым вывучэннем сувязі паміж будовай малекулы і яе біял. актыўнасцю. Вынікі навук. даследаванняў: створаны эфектыўныя каталізатары, распрацаваны новыя каталітычныя працэсы, сінтэзавана вял. колькасць новых арган. злучэнняў; закончаныя работы па палімерных матэрыялах, плацінавых каталізатарах, лесахіміі ўкаранёны на прамысл. прадпрыемствах рэспублікі і краіны.

Выдадзены працы: «Каталітычны сінтэз хінальдзіну» М. С. Казлова і П. Н. Федасеева (1935), «5, 6-Бензахіналіны» М. С. Казлова (1970), «Спалучанае з акісленнем дэкарбаксіліраванне карбонавых кіслот» М. І. Міцкевіча і Б. В. Ерафеева (1970), «Табліцы для разлікаў па тапакінетычным ураўненні» Б. В. Ерафеева і Н. Дз. Сакаловай (1963). Ін-т выдае навук. зборнікі. *М. С. Казлоў.* Мінск.

ІНСТЫТУТ ФІЗІКА-ТЭХНІ́ЧНЫ Акадэміі навук БССР, н.-д. ўстанова, якая распрацоўвае тэарэт. і практ. пытанні фізікі трываласці і пластычнасці цвёрдага цела.

Засн. ў Мінску ў 1931. Лабараторыі: пластычнасці, металазнаўства, трываласці, фізікі кантактавых з'яў, тэрмакінетыкі структурных пераўтварэнняў у металах і сплавах, фізіка-хім. механікі, прыкладной механікі, біметалічных матэрыялаў, электрафізікі, фізікі тонкіх плёнак і паверхневых слаёў. Філіял ін-та ў Магілёве (з 1970). Аспірантура з 1950. Вучоны савет па механіцы, машынабудаванні і металургіі прымае да абароны канд. і доктарскія дысертацыі па тэхн. навуках. У ін-це працаваў акад. АН БССР С. І. Губкін, працуюць

акад. АН БССР В. П. Севярдэнка, К. В. Гораў, Я. Р. Канавалаў, чл.-кар. АН БССР А. І. Вейнік. З 1957 да 1970 дырэктар ін-та акад. АН БССР В. П. Севярдэнка, з 1971 в. а. канд. тэхн. н. В. Н. Чачын.

Асн. кірункі навук. даследаванняў: вывучэнне заканамернасцей цячэння металу і структурных змен пры пластычнай дэфармацыі, уплыву напружана-дэфармаванага стану на змену мех. і пластычных уласцівасцей металаў; заканамернасцей фарміравання структуры металаў і сплаваў пры іх крышталізацыі, тэрмічнай апрацоўцы і пластычнай дэфармацыі; трываласці матэрыялаў, метадаў яе павышэння і распрацоўка новых спосабаў апрацоўкі дэталяў машын; тэхнал. параметраў высакаскараснага формаўтварэння матэрыялаў; фізічных з'яў, якія ляжаць у аснове электрафіз. метадаў апрацоўкі матэрыялаў канцэнтраванымі патокамі энергіі; тэарэт. і эксперым. распрацоўка праблем тэрмадынамікі неабарачальных працэсаў. Вынікі навук. даследаванняў: вывучаны ўплыў размеркавання дэфектаў крышталічнай рашоткі і субструктурных змен на трываласць і пластычнасць металаў; распрацаваны тэарэт. асновы тэрмакінетыкі рэкрышталізацыі і тэхнал. асновы рэкрышталізацыйнага адпальвання пры хуткім неперарыўным нагрэве, распрацаваны новыя тэхнал. працэсы (гарачае гідрадынамічнае выцісканне інструментаў і вырабаў; ратацыйнае дарнаванне і ратацыйнае рэзанне; электраэразійная і электраімпульсная апрацоўка; атрыманне літых вырабаў метадам намарожвання і паверхневае легіраванне адлівак; стварэнне новых матэрыялаў са спец. ўласцівасцямі).

Выдадзены працы: «Прыбліжаны разлік працэсаў цеплаправоднасці» А. І. Вейніка (1959), «Тэорыя зацвярдзення адліўкі» А. І. Вейніка (1960), «Асновы новых спосабаў металаапрацоўкі» Я. Р. Канавалава (1961), «Тэорыя апрацоўкі металаў ціскам» В. П. Севярдэнкі (1966), «Тэарэтычныя асновы коўкі і гарачай аб'ёмнай штампоўкі» Я. М. Макушка, А. С. Матусевіча, В. П. Севярдэнкі і У. М. Сегала (1968), «Тэрмадынаміка ліцейнай формы» А. І. Вейніка (1968), «Тэрмакінетыка рэкрышталізацыі» М. М. Бадзяка, С. А. Астапчыка і Г. Б. Ярашэвіча (1968), «Чыставая і ўмацавальная ратацыйная апрацоўка паверхні» Я. Р. Канавалава і В. А. Сідарэнкі (1968), «Асновы тэорыі пракаткі» В. П. Севярдэнкі (1969), «Пракатка і валачэнне з ультрагукам» В. П. Севярдэнкі, У. У. Клубовіча і А. В. Спепаненкі (1970). Выдае навук. зборнікі (з 1954). *В. К. Грыбоўскі.* Мінск.

ІНСТЫТУТ ФІЗІКІ Акадэміі навук БССР, навукова-даследчая ўстанова, якая распрацоўвае тэарэт. і практ. пытанні оптыка-спектраскапічнага профілю.

Засн. ў Мінску ў 1955 на базе сектара фізікі і матэматыкі Фізіка-тэхн. ін-та. Лабараторыі: тэарэт. фізікі, агульнай спектраскапіі, фізікі інфрачырвоных прамянёў, люмінесцэнцыі, нераўнаважных працэсаў, фотахіміі, оптыкі рассейвальных асяроддзяў, спектраскапіі плазмы, аптычнай электронікі, ядзернай спектраскапіі, малекулярнага спектральнага аналізу, крышталаоптыкі, генеравальных арган. злучэнняў, нелінейнай спектраскапіі і інш., 5 канструктарскіх аддзелаў. Філіял ін-та ў Магілёве (з 1970). У 1959 в складу ін-та вылучаны *Інстытут матэматыкі.* Аспірантура з 1955. Вучоны савет па фізіцы пры Аддзяленні фізіка-матэм. навук прымае да абароны канд. і доктарскія дысертацыі па фізіка-матэм. навуках. У ін-це працуюць акад. АН БССР М. А. Барысевіч, М. А. Ельяшэвіч, А. Н. Сеўчанка, Ф. І. Фёдараў, чл.-кар. АН БССР Б. В. Бойка, Г. П. Гурыновіч. Дырэктар акад. АН БССР В. І. Сцяпанаў (з 1957).

Асн. кірункі навук. даследаванняў: спектраскапія і люмінесцэнцыя, квантавая электроніка і лазерная спектраскапія, нелінейная оптыка, пізкатэмпературная плазма, оптыка крышталяў, фотахімія, оптыка рассейвальных асяроддзяў, тэорыя элементарных часцінак, ядзерная спектраскапія і інш. Асн. вынікі навук. даследаванняў: створана тэорыя люмінесцэнцыі складаных малекул, тэорыя оптыкі і акустыкі анізатропных асяроддзяў; распрацаваны асн. пытанні люмінесцэнцыі малекул у газавай фазе; адкрыта генерацыя растворaў арган. злучэнняў; распрацаваны метады разліку аптычных квантавых генератараў, дыягностыкі плазмы; вывучаны аптычныя ўласцівасці малекул хларафілу і блізкіх яму злучэнняў, заканамернасці распаўсюджвання святла ў мутным асяроддзі і інш. Ін-т распрацоўвае і ўкараняе метады атамнага і малекулярнага спектр. аналізу ў нар. гасп. Па выніках навук. даследаванняў атрымана 29 аўт. пасведчанняў на вынаходства ў СССР. І. ф. ўзнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга (1967).

Выдадзены працы: «Люмінесцэнцыя складаных малекул» Б. І. Сцяпанава (1956), «Оптыка анізатропных асяроддзяў» Ф. І. Фёдарава (1958), «Практычны дапаможнік па спектральным аналізе» В. С. Буракова і А. А. Якоўскага (1960), «Асновы спектраскапіі адмоўных светавых патокаў» Б. І. Сцяпанава (1961), «Атамная і малекулярная спектраскапія» М. А. Ельяшэвіча (1962), «Уводзіны ў тэорыю люмінесцэнцыі» Б. І. Сцяпанава і В. П. Грыбкоўскага (1963), «Адбіццё святла ад паглынальных асяроддзяў» А. П. Прышывалкі (1963), «Інфрачырвоныя спектры цэлюлозы і яе вытворных» Р. Г. Жбанкова (1964), «Тэорыя пругкіх хваляў у крышталях» Ф. І. Фёдарава (1965), «Метады разліку аптычных квантавых генератараў» пад рэд. Б. І. Сцяпанава (т. 1—2, 1966—68), «Узбуджаныя станы складаных малекул у газавай фазе» М. А. Барысевіча (1967), «Спектраскапія хларафілу і блізкіх яму злучэнняў» Г. П. Гурыновіча, А. Н. Сеўчанкі і К. М. Салаўёва (1968), «Оптыка рассейвальных асяроддзяў» А. П. Іванова (1969), «Абагульненыя ператварэнні Лорэнца і іх выкарыстанне» В. С. Іваніцкай (1969) і інш. Ін-т выдае *«Журнал прикладной спектроскопии»* (з 1964). *В. С. Бураков.* Мінск.

ІНСТЫТУТ ФІЗІКІ ЦВЁРДАГА ЦЕЛА І ПАЎПРАВАДНІКОЎ Акадэміі навук БССР, навукова-даследчая ўстанова, якая распрацоўвае тэарэт. і практычныя пытанні фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў.

Засн. ў 1963 у Мінску на базе Аддзела фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў. Лабараторыі: фізікі цвёрдага цела, фізікі нізкіх тэмператур і моцных магн. палёў, актывацыйнага аналізу, радыяцыйных даследаванняў, рэнтгенаграфічных даследаванняў, нейтронаграфічных даследаванняў, ферамагн. плёнак, аналіт. хіміі, неметал. ферамагнетыкаў, высокага ціску. Аспірантура з 1963. У ін-це працуе чл.-кар. АН БССР Я. М. Лабанаў. Дырэктар акад. АН БССР М. М. Сірата (з 1963).

Асн. кірункі навук. даследаванняў: вывучэнне прыроды хім. сувязі ў цвёрдых целах, іх фіз. уласцівасцей у залежнасці ад саставу, т-ры, ціску, напружання магнітных і электрычных палёў; даследаванне працэсаў крышталізацыі; распрацоўка фіз. асноў паўправадніковых прылад; пошукі новых паўправадніковых і магнітных матэрыялаў; атрыманне і даследаванне звышправодных матэрыялаў; даследаванне радыяцыйных уплываў на паўправаднікі. Вынікі навук. даследаванняў: вывучана размеркаванне электронаў і спінавай шчыльнасці ў крышталічнай рашотцы; распрацаваны метады разліку зарадаў фіз. уласцівасцей крышталяў па рэнтгена- і нейтронаграфічных паказчыках; новыя ферамагнітныя і паўправадніковыя матэрыялы, у т. л. плёначныя, якія маюць высокія фіз. ўласцівасці; апаратура высокага ціску, якая дала магчымасць стварыць методыку атрымання маналіт ных поліхрышталічных вырабаў з звышцвёрдага сплаву на аснове нітрыду бору, і інш.

Выдадзены працы: «Табліды трыганаметрычных функцый для падліку размеркавання электронаў шчыльнасці ў крышталях» І. М. Кунцэвіча, М. М. Аллхновіча і А. У. Шэлега (1967), «Тэрмадынаміка і статыстычная фізіка» М. М. Сірата (1969), «Дыферэнцыяльны спектрафотаметрычны аналіз» У. П. Баркоўскага і У. І. Ганапольскага (1969), «Фізіка-хімічная прырода фаз пераменнага саставу» М. М. Сірата (1970). Выдае навук. зборнікі. *Л. Ф. Ільюшэнка.* Мінск.

ІНСТЫТУТ ФІЗІЯЛОГІІ Акадэміі навук БССР, навукова-даследчая ўстанова, якая распрацоўвае тэарэт. і практ. пытанні вывучэння механізмаў рэгуляцыі функцый арганізма чалавека і жывёлы.

Засн. ў 1953 у Мінску на базе Ін-та тэарэт. медыцыны. Лабараторыі: агульнай фізіялогіі, спец. фізіялогіі, паталагічнай фізіялогіі нервовай сістэмы, марфалогіі нервовай сістэмы, біяхіміі. Аспірантура з 1953. Вучоны савет ін-та прымае да абароны канд. і доктарскія дысертацыі па біял. навуках. У ін-це працавалі акад. АН БССР А. Я. Пракапчук, чл.-кар. АН БССР М. І. Арычын і А. Ю. Бранавіцкі; працуюць акад. АН БССР Д. М. Голуб, Д. А. Маркаў і І. Дз. Мішэнін. Дырэктар акад. АН БССР І. А. Булыгін (з 1953).

Асн. кірункі навук. даследаванняў: рэфлекторная і рэцэпторная функцыі вегетатыўных (нервовых) вузлоў (гангліяў) і іх роля ў цэнтраімклівых сувязях унутр. органаў; структурна-функцыянальныя асаблівасці ўнутраных і вонкавых аналізатараў; нервовыя і гумаральныя (хімічныя) механізмы рэгуляцыі функцый арганізма чалавека і жывёлы ў норме і паталогіі (пры прамянёвых паражэннях, рассеяным склерозе і інш.). Вынікі навук. даследаванняў: вызначаны новыя функцыі вегетатыўных гангліяў і іх роля ў цэнтраімклівых сувязях унутраных органаў; прапанавана і эксперым. абгрунтавана палажэнне пра множства аферэнтных (адчувальных) шляхоў унутраных органаў і пра ўскладненні гэтых шляхоў у філагенезе (гістар. развіцці) назаночных; эксперым. распрацаваны аперацыі па стварэнні новых нервовых шляхоў; вызначаны структурна-функцыянальныя асаблівасці ўнутраных і вонкавых аналізатараў; знойдзены невядомы да гэтага механізм сувязі ўнутраных органаў з карой вялікіх паўшар'яў (названы сімпата-рэтыкулярным узыходным механізмам); вызначаны кальцавыя сувязі ўнутраных органаў, сасудаў і вегетатыўных гангліяў з цэнтр. перв. сістэмай, паказана роля кальцавых механізмаў у ланцуговых рэакцыях арганізма; вывучаны нейрагумаральныя ўзаемаадносіны пры некат. нармальных і паталагічных рэакцыях арганізма; эксперым. абумоўлены і ўкаранёны ў практыку новыя аперацыі на органах страўнікава-кішачнага тракту і выдзялення.

Выдадзены працы: «Даследаванні заканамернасцей і механізмаў інтэрацэптыўных рэфлексаў» І. А. Булыгіна (1959), «Ланізуючае выпрамяненне і абмен рачывау» Л. С. Чаркасавай (у саавт., 1962), «Замыкальная і рэцэпторная функцыі вегетатыўных гангліяў» І. А. Булыгіна (1964), «Утварэнне новых нервовых і сасудзістых шляхоў органаў малога таза» пад рэд. Д. М. Голуба (1964), «Асновы патагенетычнай тэрапіі хвароб нервовай сістэмы» Д. А. Маркава (1964), «Аферэнтныя шляхі інтэрацэптыўных рэфлексаў» І. А. Булыгіна (1966), «Лабірынтныя і экстралабірынтныя механізмы пекаторых саматычных і вегетатыўных рэакцый на паскарэнне» А. С. Дзмітрыева (1969), «Ланцуговыя і кальцавыя нейрагумаральныя механізмы вісцэральных рэфлекторных рэакцый» І. А. Булыгіна (1970) і інш. Ін-т выпускае «Працы» (з 1956) і навуковыя зб. па фізіялогіі. *І. А. Булыгін.* Мінск.

ІНСТЫТУТ ФІЛАСОФІІ І ПРАВА Акадэміі навук БССР, навукова-даследчая ўстанова, якая распрацоўвае тэарэтычныя і практычныя пытанні філасофіі, права, сацыялогіі.

Засн. ў 1931 у Мінску у складзе АН БССР. У 1935 аб'яднаны з Ін-там сав. буд-ва і права АН БССР (існаваў в 1931) і перайменаваны ў Ін-т філасофіі і права. У гады Айч. вайны не працаваў. У 1946 у АН БССР створаны сектар філасофіі, на базе якога ў 1947 адноўлены Ін-т філасофіі і права. У 1958 в ін-та вылучаны сектар права, які ў 1965 зноў увайшоў у склад ін-та. Аддзелы: філасофіі (з сектарамі дыялект. матэрыялізму і філас. пытанняў прыродазнаўства, тэарэт. праблем камунізма, гісторыі філасофіі), сац. даследаванняў (з сектарамі навук. кіравання сац. працэсамі, сац. праблем вёскі, сац. планавання), права (з сектарамі тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, гасп. і прац. права, дзярж. кіравання і сав. буд-ва). Аспірантура з 1931. У розны час у ін-це працавалі акад. АН БССР С. Я. Вальфсон (першы дырэктар ін-та), акад. АН СССР Г. Ф. Аляксандраў, чл.-кар. АН БССР І. М. Ільюшын, чл.-кар. АН БССР І. М. Лушчыцкі; працуюць акад. АН БССР В. А. Сярбента, чл.-кар. АН БССР С. П. Маргунскі. Дырэктар чл.-кар. АН БССР К. П. Буслаў (з 1956).

Асн. кірункі навук. даследаванняў: заканамернасці развіцця сацыялізма і пераходу да камунізма; сацыялагічныя праблемы буд-ва камунізма; дыялектычны матэрыялізм і філас. пытанні прыродазнаўства; гісторыя філас. і сацыялагічнай думкі; удасканаленне прававога рэгулявання грамадскіх адносін і ўмацаванне сацыяліст. прававарадку.

Выдадзены працы: «Фарміраванне і развіццё беларускай сацыялістычнай нацыі» (1958), «Аб «Філасофскіх сшытках» У. І. Леніна» (1959), «З гісторыі філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі» (1962), «Сацыяльныя змены рабочага класа Беларусі ў працэсе будаўніцтва камунізма» (1965), «Будаўніцтва камунізма і сацыяльныя змены ў сялянстве Беларусі» (1966), «Нарысы гісторыі марксісцка-ленінскай філасофіі ў Беларусі» (1968), «Органы дзяржаўнага кіравання Беларускай ССР» (1968), «Гнасеалагічныя праблемы фармалізацыі» (1969), «Баптызм і баптысты (Сацыялагічны нарыс)» (1969), «Структура савецкай інтэлігенцыі» (1970), «Гісторыя дзяржавы і права Беларускай ССР» (т. 1, 1970); «Ідэалогія загніваючага капіталізму» С. Я. Вальфсона (1934), «Аб пралетарскім інтэрнацыяналізме ў нацыянальна-каланіяльным пытанні» С. Я. Вальфсона і І. М. Ільюшына (1935), «Гісторыя сацыялагічных вучэнняў. Старажытны Усход» Г. Ф. Аляксандрава (1959), «Праблема адчування ў рэфлекторная тэорыя» В. М. Кавалгіна (1959), «Філасофскія асновы эвалюцыйнага вучэння Дарвіна» П. Дз. Пузікава (1959), «Праблемы сацыяльнага прагрэсу ў працах У. І. Леніна» К. П. Буслава (1963), «Аб відах супярэчнасцей» У. І. Горбача (1964), «Дзяржаўнае будаўніцтва БССР у гады аднаўлення народнай гаспадаркі» С. П. Маргунскага (1966), «Крытыка тэорыі «адзінага індустрыяльнага грамадства» Г. П. Давідзюка (1968), «Узаемасувязь катэгорый дыялектыкі» Дз. І. Шыраканава (1969), «Ахова працы ў СССР» В. І. Семянікова (1970) і інш.

К. П. Буслаў. Мінск.

ІНСТЫТУТ ФРАНЦЫІ, афіцыйная цэнтральная навуковая ўстанова Францыі. Засн. ў 1795. Аб'ядноўвае 5 акадэмій: Французскую акадэмію, Акадэмію надпісаў і прыгожага пісьменства, Акадэмію навук, Акадэмію мастацтваў, Акадэмію маральных і паліт. навук.

Французская акадэмія (засн. ў 1635) даследуе праблемы мовы і л-ры. Акадэмія надпісаў і прыгожага пісьменства (1663) вывучае гісторыю, даследуе старажытныя і ўсх. мовы і сярэдневяковыя гаворкі. Акадэмія навук (1666) мае 11 секцый: геаметрыі, механікі, астраноміі, геаграфіі і суднаходства, фізікі, хіміі, геалогіі, батанікі, заалогіі, с. гаспадаркі, медыцыны і хірургіі. Акадэмія мастацтваў (1803) мае 5 секцый: жывапісу, скульптуры, архітэктуры, гравюры, муз. кампазіцыі. Акадэмія маральных і палітычных навук (1832) мае 6 секцый: філасофіі; маральных і сацыялагічных навук; права, закону і юрыспрудэнцыі; паліт. эканоміі, статыстыкі і фінансаў; гісторыі і геаграфіі; агульную. На чале І. Ф. стаіць Камітэт з 10 членаў (па 2 чл. ад кожнай акадэміі), які выбіраецца на год. Акадэміі І. Ф. выпускаюць навук. перыядычныя выданні «Comptes Rendus» («Пратаколы»), «Mémoires» («Весці»), «Notices et Discours» («Даклады і паведамленні»), «Annuaire» («Штогоднік») і інш., прысуджаюць прэміі за дасягненні ў галіне навукі, л-ры, мастацтва і г. д.

ІНСТЫТУТ ЦЕПЛА- І МАСААБМЕНУ Акадэміі навук БССР, навукова-даследчая ўстанова, якая распрацоўвае тэарэт. і практ. пытанні цепла- і масапераносу ў капілярна-парыстых целах, дысперсных асяроддзях і рэалагічных сістэмах. Па гэтай навук. праблеме ін-т з'яўляецца вядучай н.-д. установай у СССР, узначальвае Навук. савет Дзярж. к-та СМ СССР па навуцы і тэхніцы па праблеме «маса- і цеплаперанос у тэхнал. працэсах».

Засн. ў 1952 у Мінску на базе энерг. сектара АН БССР (з 1947), да 1963 наз. Ін-там энергетыкі. Лабараторыі: дысперсных сістэм; матэм. тэорыі пераносу; ніжніх т-р; плазмахіміі; рэалагічнай фізікі; цеплааховы; сушыльна-тэрмічнай; электратэрмічных працэсаў; цеплафізікі; тэрмааэрадынамікі; тэрмагідрамеханікі; энерграперанасу. Пры ін-це спец. канструктарскае бюро і доследная вытворчасць. Аспірантура з 1952. Вучоны савет ін-та прымае да абароны канд. і доктарскія дысертацыі па тэхн. і фізіка-матэм. навуках. У ін-це працуюць члены-кар. АН БССР С. С. Забродскі, Б. М. Смольскі, А. Г. Шашкоў. Дырэктар акад. АН БССР А. В. Лыкаў (з 1956).

Асн. кірункі навук. даследаванняў: тэорыя спалучаных задач; узаемадзеянне капілярна-парыстых целаў з вонкавым газавым асяроддзем пры фазавых і хім. пераўтварэннях, а таксама ў розных стацыянарных і нестацыянарных умовах; цепла- і масаабмен у дысперсных і рэалагічных сістэмах; распрацоўка генератараў нізкатэмпературнай плазмы і плазмахіміі. Вынікі навук. даследаванняў: вынайдзены новыя спосабы скараснага безакісляльнага нагрэву металу, тэрмічнай апрацоўкі жалезабетонных вырабаў электрамагн. метадам; спосабы ахалоджвання кандытарскіх вырабаў; створаны вярчальны рэгенератыўны цеплаабменнік, даследавана рабочае асяроддзе для дыэлектрычных рухавікоў малой магутнасці. Вынайдзены і ўкаранёны ў вытворчасць пнеўмагазавы спосаб сушкі збожжа, электрамагн. спосаб тэрмічнай апрацоўкі і сушкі матэрыялаў, установкі для сушкі агародніны, апрацоўкі льнотрасты. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга (1969).

Выдадзены працы: «Гідрадынаміка і цеплаабмен у псеўдаажыжаным (кіпячым) слаі» С. С. Забродскага (1963), «Тэорыя цеплаправоднасці» А. В. Лыкава (1967), «Тэорыя сушкі» А. В. Лыкава (1968), «Сушка дысперсных тэрмаадчувальных матэрыялаў» І. Л. Любошыца, Л. С. Слабодкіна і І. Ф. Пікуса (1969), «Рэадынаміка і цеплаабмен нелінейных вязкапластычных матэрыялаў» Б. М. Смольскага, З. П. Шульмана і В. М. Гарыславец (1970), «Цеплаправоднасць газавых сумесяў» А. Г. Шашкова і Т. М. Абраменка (пад рэд. А. В. Лыкава, 1970), «Высокатэмпературныя ўстаноўкі з псеўдаажыжаным слоем» С. С. Забродскага (1971). Пры ін-це — рэдакцыя ад СССР міжнар. час. «International Journal of Heat and Mass Transfer» («Цепла- і масаперанос»), які выдаецца штомесяц у Оксфардзе (Англія) з 1960, і рэдакцыя ад СССР час. «Heat Transfer. Soviet Research» («Цеплаперанос, савецкія работы»), які выдаецца ў Нью-Ёрку (ЗША) з 1969 раз у 2 месяцы. Ін-т выдае навук. зборнікі. *В. М. Смольскі.* Мінск.

ІНСТЫТУТ ЧЫРВОНАЙ ПРАФЕСУРЫ, спецыяльная навукова-навучальная ўстанова, якая рыхтавала выкладчыкаў грамадскіх навук для ВНУ, супрацоўнікаў для н.-д. устаноў, парт. і дзярж. органаў.

Першы І. ч. п. арганізаваны ў 1921 у Маскве ў складзе Наркамасветы РСФСР паводле дэкрэта СНК РСФСР ад 11.2.1921, падпісанага У. І. Леніным. Агульнае кіраўніцтва ажыццяўляў аддзел агітацыі і прапаганды ЦК партыі. У 1922 І. ч. п. меў эканам., гістар. і філас. аддзяленні. З 1924 пры ін-це былі 2-гадовыя падрыхтоўчыя аддз. для рабочых-камуністаў. У 1930 І. ч. п. падзелены на ін-ты: гісторыі, гісторыка-партыйны, эканамічны, філасофскі, прыродазнаўства. У 1931 І. ч. п. злітыя в н.-д. ін-тамі Камуністычнай акадэміі і створаны самастойныя ін-ты: аграрны, сусв. гаспадаркі і сусв. палітыкі, філасофіі, гістарычны, сав. буд-ва і права, тэхнікі і прыродазнаўства, літаратуры, падрыхтоўкі кадраў. Тэрмін навучання на асн. аддз. І. ч. п. 3 гады. І. ч. п. меў вял. значэнне ў падрыхтоўцы высококваліфікаваных кадраў для парт. і дзярж. органаў, ВНУ і НДІ краіны, у т. л. і Беларусі. У 1946 створана *Акадэмія грамадскіх навук* пры ЦК ВКП(б).

Літ.: К истории Института красной профессуры. «Исторический архив», 1958, № 6.

ІНСТЫТУТ ШЛЯХЕТНЫХ ДЗЯЎЧАТ, закрытая прывілеяваная навучальна-выхаваўчая ўстанова ў дарэвалюц. Расіі для дачок дваран (ад 6 да 18 гадоў).

Першы І. ш. дз. засн. ў Пецярбургзе ў 1764 пры Васкрасенска-Смольным жаночым манастыры. У 1-й пал. 19 ст. існавалі ў Маскве, Харкаве, Адэсе, Казані, Арэнбургзе, Кіеве, Тыфлісе, Іркуцку, Астрахані, Керчы, Ніжнім Ноўгарадзе, Новачаркаску, Тамбове, Саратаве, Беластоку. Навучанне і выхаванне «свецкае», прасякнута рэлігійна-манархічным духам. Пасля Кастр. рэвалюцыі І. ш. дз. як саслоўная ўстанова ліквідаваны.

ІНСТЫТУТ ЭКАНОМІКІ Акадэміі навук БССР, навукова-даследчая ўстанова, якая распрацоўвае эканам. праблемы павышэння эфектыўнасці грамадскай вытворчасці, развіцця нар. гасп. БССР.

Арганізаваны ў 1931 у складзе АН БССР. Сектары: палітэканоміі; эканомікі тэхн. прагрэсу; эфектыўнасці капітальных укладанняў; эканомікі навук. даследаванняў; аграрных праблем; эканам. кібернетыкі; гаспадарчага разліку; эфектыўнасці размяшчэння вытворчасці; цэнаўтварэння; эканамічнай гісторыі; эфектыўнасці размяшчэння вытворчасці. Аспірантура з 1945. Аб'яднаны вучоны савет пры Аддзяленні грамадскіх навук прымае да абароны канд. і доктарскія дысертацыі ў галіне эканомікі. У ін-це працавалі акад. АН БССР В. М. Лубяка, В. С. Нямчынаў, І. А. Пятровіч. Дырэктар акад. АН БССР Ф. С. Марцінкевіч (з 1964).

Асн. кірункі навук. даследаванняў: вывучэнне заканамернасцей развіцця вытв. адносін сацыялізма, эканам. праблем навук.-тэхн. прагрэсу, распрацоўка сістэм аптымальнага функцыянавання сацыяліст. эканомікі.

Выдадзены працы: «Эканамічная геаграфія Беларускай ССР» (1956), «Шляхі павышэння прадукцыйнасці працы ў прамысловасці БССР» (1957), «Беларуская ССР» (1957), «Эканоміка тарфяной прамысловасці» (1961), «Эканоміка Беларусі ў эпоху імперыялізму» (1963), «Эканоміка Савецкай Беларусі. 1917—1967» (1967), «Катэгорыі і законы размеркавальных адносін сацыялізма» (1968), «Уплыў умоў і фактараў на эфектыўнасць размяшчэння вытворчасцей» (1968), «Асноўныя фонды прамысловасці ва ўмовах гаспадарчай рэформы» (1969), «Планаванне прыбытку ў аптовых цэнах» (1969), «Тэхнічны прагрэс і пытанні эканомікі» (1969), «Сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні ў Беларускай ССР за гады Савецкай улады» (1970), «Аб эканамічнай эфектыўнасці капітальных укладанняў у прамысловасці» М. І. Вядуты (1960), «Размяшчэнне і спецыялізацыя сельскай гаспадаркі Беларускай ССР» Ф. С. Марцінкевіча (1961), «Гаспадарчая рэформа і прадпрыемства» А. М. Пашкевіча (1968), «Эканоміка асваення новай прадукцыі» (1970), «Эканамічная кібернетыка» М. І. Вядуты (1970) і інш. *Ф. С. Марцінкевіч.* Мінск.

ІНСТЫТУТ ЭКСПЕРЫМЕНТАЛЬНАЙ БАТАНІКІ Акадэміі навук БССР, навукова-даследчая ўстанова, якая распрацоўвае тэарэт. і практ. пытанні батанікі, фізіялогіі і біяхіміі раслін.

Засн. ў 1931 у Мінску на базе кафедраў батанікі, заалогіі і эксперым. біялогіі АН БССР, да 1947 наз. Ін-там біял. навук, у 1948—62 Ін-там біялогіі. З ін-та вылучаны як самастойныя навук. ўстановы: *Цэнтральны батанічны сад* (1958), Аддзел аховы раслін (1957), *Аддзел фізіялогіі і сістэматыкі ніжэйшых раслін* (1958), *Аддзел заалогіі і паразіталогіі* (1959), *Лабараторыя біяфізікі і ізатопаў* (1957), *Інстытут генетыкі і цыталогіі* (1965), *Аддзел мікрабіялогіі* (1966). Лабараторыі: флоры і гербарыя, геабатанікі, дрэўных раслін, экалогіі, прадукцыйнасці і воднага рэжыму фітацэнозаў, фізіялогіі харчавання раслін, фотасінтэзу, фізіялогіі хім. рэгуляцыі росту і развіцця раслін, біяхіміі і малекулярнай біялогіі, бялку і азоцістага абмену, глебавай энзімалогіі, фізіялогіі хворай раслiны, ніжэйшых раслін. Пры ун-це вегетацыйны павільён. Аспірантура з 1946. Ін-т мае два вучоныя саветы па абароне канд. і доктарскіх дысертацый па біял. навуках. У ін-це працавалі акадэмікі АН БССР М. М. Кулагін, А. Р. Жэбрак, В. Ф. Купрэвіч, Ц. М. Годнеў, А. У. Фядзюшын; працуюць акадэмікі АН БССР М. А. Дарожкін, М. Дз. Несцяровіч, І. Д. Юркевіч, А. С. Вечар. Дырэктар ін-та чл.-кар. АН БССР М. М. Ганчарык (з 1967).

Асн. кірункі навук. даследаванняў: флора, геабатаніка, дэндралогія, экалогія; харчаванне раслін, хім. рэгуляцыя росту раслін, біяхімія і малекулярная біялогія, фотасінтэз, азотны абмен у раслінах і інш. Вынікі навук. даследаванняў: праведзена вывучэнне флоры Беларусі, інтрадукцыі дрэў і кустоў БССР, даследавана ўзаемадзеянне каранёвых сістэм, фізіял. ўздзеяння іонаў хлору на расліны, дзейнасць хім. рэгулятараў росту і развіцця раслін, распрацаваны пытанні біясінтэзу хларафілу, палягання збожжавых на тарфяных глебах, алкалоіднасці лубіну, складзена карта расліннасці Беларусі.

Выдадзены працы: «Пластыды раслін, іх уласцівасці, састаў і будова» А. С. Вечара (1961), «Хларафіл. Яго пабудова і ўтварэнне ў раслінах» Ц. М. Годнева (1963), «Фізіялогія і біяхімія лубіну» А. В. Міроненкі (1965), «Плады і насенне лісцевых дрэўных раслін» М. Дз. Несцяровіча, Н. І. Чакалінскай і Ю. Д. Сіроткіна (1967), «Вызначальнік раслін Беларусі» пад рэд. Б. К. Шышкіна, М. П. Томіна і М. М. Ганчарыка (1967), «Фізіялагічнае дзеянне гербіцыдаў на сарты культурных раслін» С. М. Маштакова, В. П. Дзеевай і А. П. Вальлынца (1967), «Тыпы і асацыяцыі чорнаальховых лясоў» І. Д. Юркевіча, В. С. Гельтмана і М. Ф. Лоўчага (1968), «Балотныя лясы і іх меліярацыя» Л. П. Смаляка (1969), «Асаблівасці фізіялогіі росту хлебных злакаў на тарфяной глебе» В. М. Цярэнцьева (1970) і інш. Штогод выдае навук. зборнікі. *М. М. Ганчарык.* Мінск.

ІНСТЫТУТ ЯДЗЕРНАЙ ЭНЕРГЕТЫКІ Акадэміі навук БССР, навукова-даследчая ўстанова, якая распрацоўвае тэарэт. і практ. пытанні ядзернай энергетыкі і радыяцыйнай хіміі.

Засн. ў 1965 у Мінску на базе яд. рэактара (з 1962) і лабараторый Ін-та цепла- і масаабмену. Дырэктар акад. АН БССР А. К. Красін (з 1965). У ін-це працуе чл.-кар. АН БССР І. І. Саламатаў. Аспірантура (з 1965).

Асн. кірункі навук. даследаванняў: вывучэнне дысацыіруючых газаў як цепланосьбітаў і рабочых целаў атамных эл. станцый, фізікі рэактараў на скорых нейтронах з дысацыіруючымі цепланосьбітамі, радыяцыйнай мадыфікацыі матэрыялаў, радыяцыйна-хім. працэсаў атрымання каштоўных для нар. гасп. хім. прадуктаў, распрацоўка пытанняў выкарыстання гама-радыяцыі ў нар. гасп. Асн. вынікі: даследаваны ўласцівасці дысацыіруючых цепланосьбітаў, сумесна з інш. арг-цыямі распрацаваны праект турбін магутнасцю 1 млн. *квт* на дысацыіруючым газе, габарыты якой у 4—6 разоў меншыя за габарыты аналагічных турбін на вадзяной пары; распрацаваны перадэскізны праект атамнай электрастанцыі цеплавой магутнасцю 30 тыс. *квт* з рэактарам на скорых нейтронах з дысацыіруючым газавым цепланосьбітам N_2O_4 (рэактар мае палепшаныя фіз. характарыстыкі ў параўнанні з такімі ж рэактарамі на патрыевым вадкаметалічным цепланосьбіце); даследаваны працэсы радыяцыйна-хім. атрымання шэрагу каштоўных хім. прадуктаў; атрыманы ўзоры драўніны і валокнаў з палепшанымі якасцямі і інш.

Выдадзены працы: «Тэрмадынамічныя і пераносныя ўласцівасці хімічна рэагавальных газавых сістэм» (1967), «Аптымізацыя параметраў энергетычных установак з выкарыстаннем дысацыіруючых рабочых целаў» М. А. Бажына, В. П. Бубнова, В. Б. Несцярэнкі і Н. М. Шыраевай (1970), «Дысацыіруючыя газы як цепланосьбіты і рабочыя целы энергет. установак» (1970). *А. М. Дзвойна.* Мінск.

ІНСУЛІН (лац. insula востраў), гармон падстраўнікавай залозы, які выдзяляецца клеткамі астраўкоў Лангерганса. Першы бялок, хім. будова якога высветлена канчаткова.

Макрамалекула І. мае манамеры (мал. маса іх 6000), а кожны манамер — 2 поліпептыды (адзін складаецца з 21 амінакіслотнага астатку, другі — з 30). Поліпептыды злучаны сульфідными мосцікамі. У 1964 І. атрыманы сінтэтычна. Уплывае на падтрыманне пастаяннага ўнутранага асяроддзя жывёльнага арганізма: памяншае колькасць цукру ў крыві, садзейнічае пераходу яго ў глікаген, паляпшае засваенне тканкамі вугляводаў, актывізуе сінтэз бялку з амінакіслот, ператварэнне вугляводаў у тлушч. Ужываецца ў медыцыне пры цукровым дыябеце, шызафрэніі, інтаксікацыі.

Літ.: Гл. пры арт. *Гармоны.*

ІНСУЛЬТ (лац. insultus прыступ, скачок), апаплексія, вострае парушэнне мазгавога кровазвароту.

І.— адна з найважн. сац.-мед. праблем сучаснасці. Вынік І. ў 25—35% выпадкаў — смерць і больш за 35% выпадкаў — інваліднасць. Адрозніваюць 2 віды І.: гемарагічны — ад парушэння артэрый з кровазліццём у мозг, яго жалудачкі і падабалонкавую поласць (бывае ў хворых на гіпертанічную хваробу і атэрасклероз мазгавых сасудаў); ішэмічны — ад вострага і хранічнага расстройства цыркуляцыі крыві па сонных, пазваночных і мазгавых артэрыях. Ішэмічныя І. падзя-

ляюць па трамбатычныя — ад утварэння крывянога згустка (тромба), закупорвання (эмбалі) кавалачкамі тканак, кропелькамі тлушчу; нетрамбатычныя — ад звужэння сасудаў, запалення артэрый, сасударухальных, гемадынамічных, біяхімічных парушэнняў. Прыкметы гемарагічнага І.: раптоўна праціцца прытомнасць і сіла ў руцэ і назе, парушаецца мова, адчувальнасць, рухомасць, дыханне, сардэчная дзейнасць, мочавыдзяленне. Пры ішэмічным І. такія прыкметы паўзляюцца паступова на працягу некалькіх гадзін (без страты прытомнасці). Лячэнне пераважна медыкаментознае, зрэдку хірургічнае. Прафілактыка: лячэнне гіпертанічнай хваробы, атэрасклерозу, рэўматызму, дыэта, рэжым працы і адпачынку.

Літ.: Аносов Н. Н. и Виленский Б. С. Ишемический инсульт, Л., 1963; Злотник Э. И. Аневризмы сосудов головного мозга, Мн., 1967.

П. П. Прыгун. Мінск.

ІНТАНАЦЫЯ ў м о в а з н а ў с т в е (ад лац. intono гучна вымаўляю), 1) фразавая І. ці мелодыка — комплекс прасадычных элементаў мовы (рух асн. тону голасу, тэмбр, рытм, тэмп, інтэнсіўнасць маўлення), з дапамогай якога вуснае выказванне арганізуецца ў адзінае цэлае.

Сродак дзялення моўнай плыні на фразы і сінтагмы. Выражае некат. сінтаксічныя значэнні (напр., паказвае на апавядальны, пытальны ці клічны характар сказа), перадае мадальныя і эмацыянальныя адценні вуснай мовы. Часткова адлюстроўваецца на пісьме знакамі прыпынку, абзацамі і г. д.

2) Танальны або музычны націск — рух асн. тону голасу ў межах склада (кітайская і інш. мовы) ці слова (японская, серба-харвацкая і інш. мовы).

ІНТАНАЦЫЯ ў м у з ы ц ы, 1) увасабленне думкі, пачуцця, жыццёвага зместу ў муз. гуках; у вузкім сэнсе — найменшы меладычны зварот, які захоўвае выразнае значэнне і тыповы для індывідуальнага стылю пэўнага кампазітара, нац. муз. культуры, нават гістар. перыяду. Шырока распрацаванае Б. Асаф'евым паняцце І. стала адным з асн. у сав. муз. эстэтыцы і тэорыі музыкі; яно звязана з разуменнем музыкі як асобнай формы адлюстравання рэчаіснасці. 2) Узнаўленне муз. гуку або інтэрвалу з той ці інш. ступеняю дакладнасці адносна вышыні гучання (выкананне лічыцца інтанацыйна дакладным, калі кожны інтэрвал ці гук не выходзяць за межы сваёй *зоны*). 3) Дакладнасць, роўнасць, чысціня настройкі гукарада муз. інструмента.

Літ.: Асафьев Б. В. Музыкальная форма как процесс, кн. 1—2, Л., 1963; Интонация и музыкальный образ. Сб. ст., М., 1965.

ІНТАРЭС (лац. interest мае значэнне), спецыфічныя адносіны асобы да аб'екта, выкліканыя ўсведамленнем яго жыццёвага значэння і эмацыянальнай прывабнасцю. І. аб'ектыўныя па сваім характары, іх змест не залежыць ад волі і свядомасці людзей. Яны абумоўлены эканам. адносінамі гр-ва, эканам. становішчам сац. груп і гістар. супольнасцей.

І. бывае кароткачасовы і ўстойлівы, непасрэдны і апасродкаваны. Кароткачасовы ўзнікае ў працэсе выканання пэўнага дзеяння і згасае з яго адзяйснешнем. Устойлівы цесна звязаны са светапоглядам асобы, выступае пастаянным пабуджальнікам пазнання. Непасрэдны І. выклікаецца непасрэднай эмацыянальнай прывабнасцю аб'екта, а апасродкаваны — адносінамі да аб'екта як сродку дасягнення мэты дзейнасці. Адпаведна посьбітам адрозніваюцца І.: класавыя, нацыянальныя, агульнанародныя, а таксама партыйныя, дзяржаўныя, прафсаюзныя. У антаган. грамадствах непазбежна ўзнікаюць супярэчнасці паміж агульнымі і асабістымі І. З пераходам да сацыялізма ствараюцца ўмовы для адзінства карэнных І. класаў, сац. праслоек і груп грамадства. І. сав. людзей вызначаюцца мэтамі пабудовы камуніст. грамадства. Гэта не выключае магчымасці супярэчнасцей паміж асабістым і грамадскім І. Палітыка Камуніст. партыі і сацыялліст. дзяржавы накіравана на забеспячэнне адзінства агульных і асабістых І. ва ўсіх сферах жыцця сацыялліст. грамадства.

Літ.: Маркс К. и Энгельс Ф. Соч., т. 1, с. 72, т. 2, с. 40, 89, т. 3, с. 47, т. 21, с. 310; Ленін У. І. Тв. [гл. Даведачны т., ч. 1 (Справочный т. к Полн. собр. соч., ч. 1)]; Плеханов Г. В. Сочинения, т. 12, М., [1925], с. 490; Глезерман Г. Е. Исторический материализм и развитие социалистического общества, М., 1967; Грушин Б. А. Мнения о мире и мир мнений, М., 1967, гл. 3, § 15; Гусев А. Общество и личность, Мн., 1963.

І. В. Шыкунова. Мінск.

ІНТРАДУКЦЫЯ ў м у з ы ц ы (ад лац. introductio увядзенне), 1) уступны фрагмент (звычайна ў павольным тэмпе), які часам папярэднічае паказу асн. тэмы ў інстр. творах буйной формы. 2) Род уверцюры ў оперы ці ў балеце. 3) Вак. ансамбль або хар. сцэна ў пачатку оперы (напр., у операх М. Глінкі).

ІНТРАДУКЦЫЯ (у б і я л о г і і), перасяленне чалавекам асобных відаў (пород, сартоў) карысных жывёл і раслін у мясцовасці, дзе яны раней не жылі. Цесна звязана з *акліматызацыяй*.

Літ.: Базилевская Н. А. Теория и методы интродукции растений, М., 1964; Вавилов Н. И. Избр. труды, т. 5, М.—Л., 1965; Интродуцированные деревья и кустарники в Белорусской ССР, в. 1—3, Мн., 1959—61; Деревья и кустарники, розы и сирень, Мн., 1968; Шкутко Н. В. Хвойные экзоты Белоруссии и их хозяйственное значение, Мн., 1970; Воронин Ф. Н. Фауна Белоруссии и охрана природы, Мн., 1967 (бібліягр.).

ІНТРУЗІЎНЫЯ ГОРНЫЯ ПАРОДЫ, глыбінныя горныя пароды, якія ўзнікаюць пры застыванні магмы ўнутры зямной кары.

Ва ўмовах павольнага паніжэння т-ры, ціску і ў прысутнасці лятучых кампанентаў магма паскам крышталізуецца, утвараючы поўнакрышталічныя І. г. п. дробна-, сярэдне- і грубазярністай структуры. Пры змене ўмоў крышталізацыі ўзнікаюць дробназярністыя горныя пароды парфірападобнай, афанітавай і інш. структур. Паводле хім. саставу (колькасці SiO_2) І. г. п. падзяляюцца на кіслыя (граніты, гранадыярыты), сярэднія (дыярыты, сіеніты і інш.), асноўныя (нарыты, габра, габра-нарыты, лабрадарыты) і ультраасноўныя (піраксеніты, перыдатыты, дуніты). Заляганць ввычайна ў выглядзе баталітаў, лакалітаў, штокаў, жылаў і інш. (гл. *Заляганне горных парод, Інтрузія*). Калі магма рассякае ўмяшчальныя пароды, узнікаюць вялізныя цялы (штокі, жылы, дайкі і інш.), калі рассоўвае іх — згодныя або пластавыя цялы. Паводле глыбіні заляганння І. г. п. падзяляюцца на глыбінныя — абісальныя і малых глыбінь — гіпабісальныя (гл. *Жыльныя горныя пароды*). На Беларусі разам з метамарфічнымі горнымі пародамі І. г. п. складаюць крышталічны фундамент. Гл. таксама *Магма, Магматычныя горныя пароды*.

Літ.: Заварицкий А. Н. Изверженные горные породы, М., 1956; Уэйджер Л. и Браун Г. Расслоенные изверженные породы, пер. с англ., М., 1970.

І. Д. Несцярэвіч. Мінск.

ІНТРУЗІЯ (лац. intrusio укараненне), 1) працэс укаранення магмы ў тоўшчу зямной кары. 2) Магматычнае цела, складзенае з *інтрузійных горных парод*; утвараецца ў зямной кары ў выніку застывання магмы.

ІНТУІТЫВІЗМ, суб'ектыўна-ідэаліст. кірунак у бурж. філасофіі, які разглядае *інтуіцыю* як асобную ірацыянальную здольнасць пранікнення ў сутнасць рэчаў.

Прадстаўнікі І. (А. Бергсон, Э. Гусерль, М. Лоскі і інш.) імкнуліся абгрунтаваць агнастычны тэзіс пра немагчымасць чалавечага інтэлекту пазнаць сутнасць в'яў і прадметаў, выравіць ле ў лагічных паняццях. Працэс пазнання, паводле інтуітывістаў, заснаваны на «непасрэдным успрыманні» ісціны, містычным «аварэнні». Абвяргаючы практыку як аб'ектыўны крытэрый ісціны, яны прызнаюць суб'ектыўны крытэрый ісціны — «самавідавочнасць». І. арганічна звязаны з антыінтэлектуалістычнай тэндэнцыяй сучаснай бурж. філасофіі, выступае як адна з разнавіднасцей *ірацыяналізму*. Філасофія І. садзейнічала фарміраванню фаш. ідэалогіі. Распаўсюджванне І. сведчыць пра крызіс і дэградацыю сучаснай бурж. філасофіі, ідэалогіі цалкам.

Літ.: Ленін У. І. Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм, Тв., т. 14 (Полн. собр. соч., т. 18); Плеханов Г. В. Анри Бергсон, у яго кн.: Избр. философские произв., т. 3, М., 1957; Воронов А. И. Интуитивная философия Бергсона, М., 1962; Мотрошилова Н. В. Принципы и противоречия феноменологической философии, М., 1968; Чуева И. П. Критика идей интуитивизма в России, М.—Л., 1963; Бунге М. Интуиция и наука, пер. с англ., М., 1967.

Ю. А. Гусеў. Мінск.

ІНТУІЦЫЯ (лац. intuitio пільнае ўглядзанне), спосаб пазнання ісціны ў выніку духоўна-практычнай дзейнасці чалавека. У сістэмах аб'ектыўнага і суб'ектыўнага ідэалізму І. разглядаецца як нейкая містычная здольнасць ірацыянальнага пазнання (гл. *Інтуітывізм*). Дыялектычны матэрыялізм разумее І. як вынік падсвядомага працэсу пазнання ісціны, як рэалізацыю адпаведнага алгарытму, які выпрацоўваецца розумам на аснове практыкі. У параўнанні з інш. спосабамі пазнання І. ўласцівыя свае спецыфічныя рысы: непасрэднасць, раптоўнасць, неўсвядомленасць, утоеная лагічнасць і г. д. Матэрыяліст. дыялектыка адрозніває пачуццёвую і інтэлектуальную І. ў навуковай, тэхнічнай, мастацкай творчасці. І. цесна звязана з усімі бакамі, формамі, звеннямі творчага працэсу (асабліва з прадбачаннем і ўяўленнем). Яна абумоўлена імі і ў той жа час сама робіць на іх уплыў.

Літ.: Энгельс Ф. Дыялектыка прыроды, Мн., 1954; Ленін У. І. Філасофскія сшыткі, Тв., т. 38 (Полн. собр. соч., т. 29); Асмус В. Ф. Проблема интуиции в философии и математике, 2 изд., М., 1965; Пономарев Я. А. Психика и интуиция, М., 1967; Бунге М. Интуиция и наука, пер. с англ., М., 1967.

Ю. А. Гусеў. Мінск.

ІНТУІЦЫЯНІЗМ, кірунак у матэматыцы (побач з *лагіцызмам* і *фармалізмам*), які лічыць, што дакладная матэм. думка грунтуецца на *інтуіцыі*. І. адмаўляецца ад выкарыстання *абстракцыі актуальнай бесканечнасці* і *выключанага трэцяга закону*. Задавальняецца мысленным пабудаваннем матэм. аб'ектаў, разглядаючы іх па-за залежнасцю ад свету рэчаў, у выніку чаго набліжаецца да ідэаліст. разумення асноў матэматыкі. Аднак І. у адрозненне ад *інтуітывізму* не проціпастаўляе інтуіцыю логіцы. Садзейнічае распрацоўцы *матэматычнай логікі*.

Літ.: Проблемы конструктивного направления в математике, в. 1—2, М.—Л., 1958—62 (Труды Мат. ин-та им. В. А. Стеклова, т. 52, т. 67); Вейль Г. О философии математики, пер. с нем., М.—Л., 1934; Гейтинг А. Интуиционизм. Введение, пер. с англ., М., 1965.

ІНТЭГРАВАННЕ (у м а т э м а т ы ц ы), аперацыя адшукання неазначальнага інтэграла. Гл. *Інтэгральнае вылічэнне*.

ІНТЭГРАЛ (лац. integer цэлы), граніца сумы здабытку значэнняў функцыі на прыращэнні незалежнага пераменнага.

Паняцце І. узнікла ў сувязі з неабходнасцю знаходзіць функцыі па іх *вытворных* [неазначальны І. $\int f(x)dx$ функцыі $f(x)$] і вымяраць плошчы, аб'ёмы, работу сілы за пэўны прамежак часу і г. д. [азначальны І. ад a да b — $\int_a^b f(x)dx$]. Гл. таксама *Інтэгральнае вылічэнне*.

ІНТЭГРАЛЬНАЕ ВЫЛІЧЭННЕ, раздзел матэматыкі, у якім вывучаюцца ўласцівасці і спосабы вылічэння *інтэгралаў* і іх дастасаванні.



Першыя звесткі пра знаходжанне плошчаў і аб'ёмаў метадам бесканечнага суміравання адносяцца да старажытнагрэч. матэматыкі (5—4 ст. да н. э.). Найбольш блізка падышоў да сучаснага разумення інтэгравання Архімед (3 ст. да н. э.). Стваральнікі І. в.— І. Ньютан і Г. Лейбніц, якія пабудавалі незалежна адзін ад аднаго (17 ст.) дыферэнцыяльнае і інтэгральнае вылічэнні і ўстанавілі іх узаемную абарачальнасць. Ньютан зыходзіў з задач механікі і развіў інтэграванне як дзеянне, адваротнае дыферэнцыраванню; Лейбніц разглядаў інтэграванне як граніцу сумы. Ён жа ўвёў знак $\int$. Далейшае развіццё І. в. звязана з працамі Л. Эйлера, А. Кашы, Б. Рымана, А. Лебега, Т. І. Стыльцьеса, А. М. Калмагорава і інш.

Вылічэнне неазначальнага інтэграла (інтэграванне) — дзеянне, адваротнае дыферэнцыраванню. Няхай $f(x)$ зададзеная функцыя сапраўднага пераменнага x. Яе першаобразнай ці неазначальным інтэгралам наз. такая функцыя $F(x)$, вытворная якой роўна $f(x)$. Калі C — пастаянная велічыня, тады $[F(x)+C]'=F'(x)=f(x)$. Таму, калі $F(x)$ ёсць некаторая першаобразная для $f(x)$, то ўсякая функцыя, якая адрозніваецца ад $f(x)$ на пастаяннае складаемае, будзе таксама першаобразнай. Агульную формулу першаобразнай дае неазначальны інтэграл — $\int f(x)dx=F(x)+C$. Адвольная пастаянная C вызначаецца, калі зададзена значэнне першаобразнай у якім-н. пункце. Формулы інтэгравання прасцейшых функцый атрымліваюцца шляхам абарачэння формул дыферэнцыравання. У адрозненне ад *дыферэнцыяльнага вылічэння*, дзе вытворныя ад усіх элементарных функцый вылічваюцца паводле пэўных формул і правілаў, інтэграванне толькі ў рэдкіх выпадках можа быць выканана непасрэдна па формулах. У большасці выпадкаў атрыманне інтэралаў звязана з шэрагам пераўтварэнняў. Некаторыя інтэгралы нават ад параўнальна простых функцый нельга выразіць праз элементарныя. І. в. служыць крыніцай узнікнення новых, т. зв. вышэйшых трансцэндэнтных функцый. Напр., $\int \frac{\sin x}{x}\,dx$ — інтэгральны сінус, $\int \frac{dx}{\ln x}$ — інтэгральны лагарыфм, $\int e^{-x^2}dx$ — інтэграл імавернасці. Для такіх функцый складаюцца табліцы значэнняў, аналагічна табліцам для лагарыфмаў ці трыганаметрычных функцый. Інтэграванне можна вызначыць і як граніцу сумы бесканечна вялікага ліку бесканечна малых складаемых. Няхай $f(x)$ — зададзеная на адрэзку $[a, b]$ неперарыўная функцыя (гл. рыс.). Падзелім адрэзак $[a, b]$ на n частак пунктамі $a=x_0<x_1<\ldots<x_{n-1}<x_n=b$. Абазначым даўжыню частковага адрэзка $x_k-x_{k-1}=\Delta x_k$. Возьмем у кожным частковым адрэзку адвольны пункт ξ_k. Тады $S_n=f(\xi_1)\Delta x_1+f(\xi_2)\Delta x_2+\ldots+f(\xi_n)\Delta x_n=\sum_{k=1}^{n} f(\xi_k)\Delta x_k$ — інтэгральная сума. Граніца гэтай сумы, калі лік дзя-

лення n неабмежавана ўзрастае, а даўжыня Δx_k кожнага частковага адрэзка імкнецца да нуля, наз. азначальным інтэгралам ад $f(x)$, узятым па адрэзку $[a, b]$, і абазначаецца $\int_a^b f(x)\,dx = \lim_{\substack{n\to\infty \\ \Delta x_k\to 0}} \sum_{k=1}^{n} f(\xi_k)\,\Delta x_k$, дзе a — ніжняя, b — верхняя граніца інтэгравання. Графічна (гл. рыс.) члены інтэгральнай сумы $f(\xi_k)\Delta x_k$ — плошчы прамавугольнікаў з асновай Δx_k і вышынёй $y=f(\xi_k)$, а інтэгральная сума роўная плошчы, абмежаванай знізу воссю абсцыс, дзвюма крайнімі ардынатамі, а зверху ступеньчатай ломанай лініяй. У граніцным выпадку апошняя ператвараецца ў крывую $f(x)$, г. зн. азначальны інтэграл $\int_a^b f(x)dx$ роўны плошчы крывалінейнай трапецыі, абмежаванай воссю абсцыс, дзвюма крайнімі ардынатамі і зверху крывой $y=f(x)$. Можна паказаць, што абодва паняцці інтэграла супадаюць: калі $F(x)$ першаобразная для $f(x)$ $[F'(x)=f(x)]$, то $\int_a^b f(x)dx=F(b)-F(a)$ (формула Ньютана — Лейбніца). Гэта формула — асн. сродак вылічэння азначальных інтэгралаў. Есць шэраг самастойных метадаў вылічэння азначальных інтэгралаў, не звязаных з адшуканнем першаобразных (гл. *Прыбліжанае інтэграванне*). Графікі першаобразных можна прыбліжана вычэрчваць з дапамогаю спец. механізмаў (напр., *планіметрам*). Азначальны інтэграл мае разнастайныя дастасаванні: знаходжанне даўжынь дуг крывых, плошчаў крывалінейных паверхняў і аб'ёмаў абмежаваных імі целаў, а таксама велічынь, якія выкарыстоўваюцца ў механіцы: статычных момантаў, момантаў інерцыі, каардынат цэнтраў цяжару ліній, плошчаў, аб'ёмаў і інш.

Літ.: Фихтенгольц Г. М. Основы математического анализа, т. 2, 5 изд., М., 1968; Смирнов В. И. Курс высшей математики, т. 2, М., 1967; Стройк Д. Я. Краткий очерк истории математики, пер. с нем., 2 изд., М., 1969.

Ф. Дз. Гахаў. Мінск.

ІНТЭГРАЛЬНЫЯ УРАЎНЕННІ, ураўненні, якія змяшчаюць невядомыя функцыі пад знакам інтэграла.

Прасцейшы тып — лінейнае І. ў., у якое невядомая функцыя ўваходзіць у першай ступені; яно запісваецца ў выглядзе: $\lambda\int_a^b K(x,y)\varphi(y)dy=f(x)$ (І. ў. першага роду) або $\varphi(x)+\lambda\int_a^b K(x,y)\varphi(y)dy=f(x)$ (І. ў. другога роду). У прыведзеных ураўненнях $\varphi(x)$ — невядомая функцыя, $K(x,y)$ — ядро, λ — пастаянная велічыня, $f(x)$ — свабодны член. Калі $f(x)=0$, то І. ў. наз. аднародным. Калі ядро $K(x,y)$ і свабодны член $f(x)$ — неперарыўныя, тады ўраўненне наз. І. ў. Фрэдгольма (1866—1927, швед. матэм.). Пры $K(x,y)=\sum_{i=1}^{n}\varphi_i(x)\psi_i(y)$ — ураўненне выраджанае. У гэтым выпадку яно зводзіцца да сістэмы лінейных алгебр. ураўненняў. І. ў. другога роду можна рашыць *паслядоўных прыбліжэнняў метадам*, калі параметр λ малы $[\lambda(b-a)\max|K(x,y)|<1]$. На аснове тэорыі прыбліжэння функцый любое неперарыўнае ядро можна падаць у выглядзе выраджанага і малога ядраў. Існуе тэорыя І. ў. Фрэдгольма для адвольнага неперарыўнага ядра. Тыя значэнні параметра λ, пры якіх аднароднае І. ў. мае рашэнне, адметнае ад трывіяльных нулявых, наз. яго ўласнымі значэннямі, а адпаведныя яго рашэнні — уласнымі функцыямі. Рашэнні І. ў. з сіметрычным ядром $K(x,y)=K(y,x)$ пры розных значэннях λ прыводзяцца як рад уласных функцый з пастаяннымі каэфіцыентамі. У выпадку ядраў, якія не інтэгруюцца, ці ў бясканечнай вобласці інтэгравання ўзнікаюць асаблівыя (сінгулярныя) І. ў. Добра вывучаны наст. тыпы ўраўненняў: $\varphi(t)+\int_L \frac{K(t,\tau)}{t-\tau}\varphi(\tau)d\tau=f(t)$ — І. ў. з ядром Кашы, дзе L — крывая інтэгравання, t,τ — комплексныя каардынаты; $\varphi(x)+\int_0^\infty K(x-t)\varphi(t)dt$ — І. ў. тыпу скруткі, а таксама іх абагульненні. Тэорыю такіх ураўненняў на Беларусі распрацоўвае калектыў матэматыкаў пад кіраўніцтвам Ф. Дз. Гахава. Тыпы нелінейных І. ў. разнастайныя. Тэорыя гэтых ураўненняў складаная і яшчэ мала распрацаваная. Асновы яе закладжыў рус. матэм. А. М. Ляпуноў. І. ў. маюць шматлікія дастасаванні пры рашэнні розных задач матэм. фізікі.

Літ.: Петровский И. Г. Лекции по теории интегральных уравнений, 3 изд., М., 1965; Смирнов В. И. Курс высшей математики, т. 4, 5 изд., М., 1958.

Ф. Дз. Гахаў. Мінск.

ІНТЭГРАЦЫЯ ЭКАНАМІЧНАЯ, працэс эканамічнага аб'яднання аднатыпных па грамадска-эканам. укладзе дзяржаў для дасягнення агульных інтарэсаў на аснове міжнароднай спецыялізацыі вытворчасці. Абумоўлена ростам прадукцыйных сіл, развіццём кааперавання і канцэнтрацыі вытворчасці, дзеяннем эканам. законаў у межах адпаведнай грамадска-палітычнай сістэмы і палітычнымі працэсамі, што адбываюцца ў гэтых сістэмах і ў цэлым на міжнар. арэне.

Ва ўмовах крайняга абвастрэння міжімперыяліст. супярэчнасцей, узмацнення паліт. і нац.-вызв. барацьбы, росту магутнасці сусв. сацыяліст. сістэмы імперыялізм імкнецца аб'яднаць свае сілы пад лозунгам інтэграцыі. Ствараюцца аб'яднанні капіталіст. дзяржаў, у т. л. самыя буйныя дзяржаўна-манапаліст. аб'яднанні *Еўрапейскае эканамічнае таварыства* («Агульны рынак») і *Еўрапейская асацыяцыя свабоднага гандлю*. Сапр. мэта такіх аб'яднанняў — расшырыць сферы ўплыву і рынкі збыту, забяспечыць найбольшы прыбытак для манаполій, затрымаць паліт. і нац.-вызв. барацьбу, аслабіць развіццё сусв. сацыяліст. сістэмы. Паміж гэтымі аб'яднаннямі і ўнутры іх існуюць непрымірымыя супярэчнасці, характэрныя капіталістычнаму спосабу вытворчасці. У. І. Ленін прадбачыў магчымасць пагаднення паміж капіталістамі і капіталіст. дзяржавамі, каб «...супольна душыць сацыялізм у Еўропе, супольна ахоўваць награбленыя калоніі...» (Тв., т. 21, с. 310).

Сутнасць сацыяліст. інтэграцыі — у свядомым, планамерным збліжэнні эканомікі сацыяліст. краін, развіцці супрацоўніцтва ў адпаведнасці з прынцыпамі пралетарскага інтэрнацыяналізму, на аснове раўнапраўя, павагі суверэнітэту і нац. інтарэсаў, узаемнай выгады і таварыскай дапамогі. Яна грунтуецца на аднатыпнай у кожнай з сацыяліст. краін эканам. аснове — грамадскай уласнасці на сродкі вытворчасці, на аднатыпным дзярж. ладзе — уладзе народа на чале з рабочым класам, на адзінай ідэалогіі — марксізме-ленінізме. Аб'ектыўная яе аснова — супадзенне асн. патрабаванняў эканам. законаў сацыялізма як у межах адной краіны, так і ў маштабе ўсёй сацыяліст. сістэмы. Мэта — на аснове пераваг сацыяліст. эканомікі паскорыць тэмпы навук.-тэхн. прагрэсу, больш рацыянальна выкарыстаць прыродна-эканам. рэсурсы, расшырыць і ўмацаваць міжнар. сацыяліст. рынак, павысіць эфектыўнасць вытворчасці і дабрабыт працоўных. На гэтых прынцыпах развіваюць І. э. краіны — удзельніцы *Савета Эканамічнай Узаемадапамогі* (СЭУ). Спалучаючы інтарэсы кожнай краіны з інтарэсамі ўсёй сацыяліст. сістэмы, СЭУ ажыццяўляе кааперацыю гал. галін вытворчасці, навукі і тэхнікі. Гэты працэс асабліва паглыбіўся пасля 23-й спец. (1969) і 24-й (1970) сесій СЭУ. Курс на інтэграцыю замацаваны на 25-й сесіі СЭУ, якая прыняла Комплексную праграму далейшага паглыблення і ўдасканальвання супрацоўніцтва і развіцця сацыяліст. эканам. інтэграцыі краін — чл. СЭУ. Краіны — чл. СЭУ выходзяць з таго, што дасягнуты імі высокі ўзровень развіцця прадукцыйных сіл, вял. структурныя змены ў сферы вытворчасці і спажывання, паскарэнне навук.-тэхн. прагрэсу, павышэнне эфектыўнасці вытворчасці і дабрабыту народа, а таксама характар сацыяліст. вытворчых адносін і патрабаванні класавай барацьбы з імперыялізмам робяць жыццёва неабходнымі далейшае развіццё супрацоўніцтва сацыялістычных краін. Комплексная праграма ўключае неабходныя эканам. і арганізац. мерапрыемствы і разлічана на паэтапную іх рэалізацыю на працягу 15—20 гадоў. Прадугледжвае шматбаковыя і двухбаковыя кансультацыі па асн. пытаннях эканам. палітыкі, каардынацыю нар.-гасп. планаў, планамернае расшырэнне міжнар. спецыялізацыі і кааперавання вытворчасці, навукі і тэхнікі, расшырэнне гандл. і інш. сувязей. Пры ажыццяўленні мерапрыемстваў, намечаных Комплекснай праграмай, будзе ўлічвацца неабходнасць аказання дапамогі і садзеяння больш хуткаму развіццю эканомікі, навукі і тэхнікі менш развітых у прамысл. адносінах краін — членаў Савета Эканамічнай Узаемадапамогі пры максімальнай мабілізацыі і эфектыўным выкарыстанні іх уласных рэсурсаў.

Літ.: Маркс К. і Энгельс Ф. Маніфест Камуністычнай партыі, Мн., 1968; Ленін У. І. Становішча і задачы сацыялістычнага інтэрнацыянала, Тв., т. 21 (Полн. собр. соч., т. 26); Яго ж. Першапачатковы накід тэзісаў па нацыянальнаму і каланіяльнаму пытанням, Тв., т. 31 (там жа, т. 41); Да 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна. Тэзісы ЦК КПСС, Мн., 1969; Основные принципы международного социалистического разделения труда, М., 1964; Международные экономические отношения, М., 1969; Комплексная программа дальнейшего углубления и совершенствования сотрудничества и развития социалистической экономической интеграции стран — членов СЭВ, М., 1971.

А. А. Гаеўскі. Мінск.

ІНТЭЛЕКТ (лац. intellectus пазнанне, разуменне), у шырокім сэнсе — уся пазнавальная здольнасць чалавека; у вузкім — здольнасць *мыслення, розум*.

ІНТЭЛІГЕНЦЫЯ (лац. intelligens разумны, дасведчаны, знаўца, спецыяліст), сацыяльная праслойка, прадстаўнікі якой прафесійна займаюцца разумовай працай. Да І. належаць дзеячы навукі і мастацтва, інжынеры, тэхнікі, настаўнікі, урачы і інш. прадстаўнікі разумовай працы. І. не з'яўляецца асобным класам, самастойнай палітычнай сілай, бо яна не займае самастойнага становішча ў сістэме грамадскай вытворчасці. Яе дзейнасць вызначаецца інтарэсамі тых класаў, якім яна служыць.

Узнікненне І. звязана з раздзяленнем працы, асабліва з аддзяленнем разумовай працы ад фізічнай. Асобным шматлікім сац. слоем яна становіцца толькі пры капіталізме і фарміруецца пераважна з прадстаўнікоў маёмных класаў. Ва ўмовах дзярж.-манапал. капіталізму значна мяняецца колькасць, прафес. структура І., паглыбляецца сац. дыферэнцыяцыя і супярэчлівасць яе становішча. У развітых капіталіст. краінах расце ўдзельная вага І., наглядаецца тэндэнцыя да ўсё большай яе пралетарызацыі. Пасля перамогі сацыяліст. рэвалюцыі ўзнікае праблема выкарыстання старой і фарміравання новай сацыяліст. І. з працоўных. Фарміраванне І., якая актыўна ўдзельнічае ў пабудове сацыялізма, цесна звязана агульнымі карэннымі інтарэсамі і ідэйна-паліт. адзінствам з рабочым класам і сялянствам,— адна з асн. заканамернасцей сацыяліст. будаўніцтва.

На Беларусі І. як сац. слой складвалася ў перыяд развіцця капіталізму. Бел. буржуазія І., якая пераважна выйшла з асяроддзя шляхты, абшарнікаў і заможных слаёў насельніцтва, у масе сваёй адлюстроўвала і абараняла інтарэсы пануючых класаў. Новая, сапраўды народная І. сфарміравалася ў рэспубліцы за гады сацыяліст. буд-ва. Пераважная большасць яе — выхадцы з рабочых і сялян. У агульнай колькасці работнікаў разумовай працы нац. кадры — беларусы — складаюць 68%. Стварэнне бел. сацыяліст. І.— вынік *культурнай рэвалюцыі*, трыумф ленінскай нац. палітыкі, дапамогі ўсіх сацыяліст. нацый, перш-наперш рус. народа і яго І. *Навукова-тэхнічны прагрэс* вядзе да хуткага павелічэння колькасці спецыялістаў ва ўсіх галінах навукі, тэхнікі, культуры. У БССР у 1926 работнікаў разумовай працы было 51,3 тыс., у 1939 — 377 тыс., у 1970 — больш за 1 млн. чал. На пач. 1971 у нар. гасп. рэспублікі спецыялістаў толькі з вышэйшай і сярэдняй спец. адукацыяй занята каля 580 тыс. замест 87,6 тыс. ў 1941. Хутка растуць групы вытворча-тэхнічных работнікаў, асабліва інжынерна-тэхнічных работнікаў, навукоўцаў, вясковай І. У 1941 у нар. гасп. БССР працавала інжынераў — 5,1 тыс., у 1970 — 67,2 тыс., тэхнікаў адпаведна 9,9 тыс. і 127,3 тыс. У сельскай гаспадарцы ў 1970 было каля 38 тыс. спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй замест 14,8 тыс. ў 1960. Колькасць занятых у навуцы і навук. абслугоўванні павялічылася з 4,4 тыс. ў 1940 да 61,4 тыс. чал. у 1970. На пач. 1972 навук. работнікаў было 24 тыс. чал., у т. л. 6,6 тыс. кандыдатаў і дактароў навук. Рост І. адлюстроўвае культурны ўздым бел. народа, далучэнне да інтэлектуальнае дзейнасці ўсіх сац. слаёў грамадства.

Стварэнне сацыяліст. І. ліквідавала колішні разрыў паміж разумовай і фіз. працай, прывяло да вялікіх змен у сац. структуры сав. грамадства. У класавым складзе насельніцтва БССР І. і служачых было: у 1939 — 14,5%, у 1959 — 15,9, у 1970 — больш як 20%. Ва ўмовах стварэння матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма, фарміравання камуніст. грамадскіх адносін, выхавання новага чалавека роля І. ўсё больш расце. Як асобная сац. праслойка І. астанецца і надалей «...аж да дасягнення самай высокай ступені развіцця камуністычнага грамадства...» (Ленін У. І. Тв., т. 33, с. 168). Пры поўным камунізме, калі небывала павысіцца навук.-тэхн. і культурны ўзровень працоўных і адбудзецца арганічнае зліццё разумовай і фіз. працы, І. перастане быць асобным сац. слоем.

Літ.: Ленин В. И. О науке и высшем образовании, М., 1967; Яго ж. О воспитании и образовании, М., 1970; Праграма Камуністычнай партыі

Савецкага Саюза, Мн., 1961; Матэрыялы XXIV з'езда КПСС, Мн., 1971; КПСС о культуре, просвещении и науке, М., 1963; 50 гадоў Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Пастанова Пленума ЦК КПСС. Тэзісы ЦК КПСС, Мн., 1967; Белорусская ССР за 50 лет. Статистический сб., Мн., 1968; Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 2, Мн., 1967; Советская интеллигенция (История формирования и роста. 1917—1965 гг.), М., 1968; Шавельская Н. С. Народная інтэлігенцыя Беларусі, Мн., 1959; Классы, социальные слои и группы в СССР, М., 1968; Структура советской интеллигенции, Мн., 1970; Амелин П. П. Интеллигенция и социализм, Л., 1970; Монич З. И. Интеллигенция в структуре сельского населения, Мн., 1971.

К. Л. Патаенка. Мінск.

ІНТЭНСІЎНАСЦЬ ПРАЦЫ, ступень напружанасці працы ў працэсе вытворчасці. Характарызуецца затратамі фіз., нервовых і разумовых намаганняў у залежнасці ад цяжкасці працы, тэмпу і рытму работы, каэфіцыенту выкарыстання рабочага часу. Больш інтэнсіўная праца стварае больш вартасці за адзінку часу.

Пры капіталізме, асабліва ў эпоху імперыялізму, І. п.— адзін з гал. сродкаў узмацнення эксплуатацыі працоўных, павелічэння прыбавачнай вартасці. У пагоні за звышпрыбыткамі манаполіі выкарыстоўваюць патагонныя сістэмы арганізацыі працы, ператвараюць рабочага ў прыдатак машыны, што падрывае здароўе, пагаршае становішча працоўных. У сацыяліст. краінах гал. сродак павышэння прадукцыйнасці працы не І. п., а навук.-тэхн. прагрэс, удасканаленне арганізацыі працы і кіравання, павышэнне культ.-тэхн. ўзроўню працоўных, арганізацыя сацыяліст. спаборніцтва, выкарыстанне матэрыяльных і маральных стымулаў працы.

Літ.: Маркс К. Капітал, т. 1, Мн., 1952; Ленін У. І. «Навуковая» сістэма выціскання поту, Тв., т. 18 (Полн. собр. соч., т. 23); Струмилин С. Г. Проблемы экономики труда, у яго кн.: Избр. произв., т. 3, М., 1964; Патрушев В. Д. Интенсивность труда при социализме, М., 1963; Ушеров П. Г. Производительность и интенсивность труда, М., 1965.

У. В. Шахоцька. Мінск.

ІНТЭНСІФІКАЦЫЯ ВЫТВОРЧАСЦІ (лац. intensiv узмацненне+facio раблю), развіццё прамысловасці і с. гасп. на аснове навук.-тэхн. прагрэсу пры паслядоўных дадатковых укладаннях сродкаў вытворчасці і працы, каб атрымаць найбольшую колькасць таннай прадукцыі. Найважнейшая ўмова паскарэння тэмпаў эканам. развіцця, павышэння эфектыўнасці вытворчасці.

У адрозненне ад экстэнсіўнага шляху, які характарызуецца павелічэннем колькасці сродкаў вытворчасці, іх расшыраным узнаўленнем на ранейшай тэхн. аснове, а таксама павелічэннем колькасці рабочых месцаў, інтэнсіфікацыя мае на мэце рост аб'ёмаў прадукцыі за кошт лепшага выкарыстання дзейных вытворчых магутнасцей і паляўных паляўных плошчаў пры дадатковых укладаннях сродкаў, на аснове дасягненняў навук.-тэхн. прагрэсу. Найважн. задача інтэнсіфікацыі — паскарэнне росту прадукцыйнасці працы. Гал. шляхі І. в.: навук.-тэхн. прагрэс, удасканаленне галіновай структуры прамысловасці з апераджальным развіццём прагрэс. галін, укараненне перадавых формаў арганізацыі вытворчасці, ле спецыялізацыі, кааперавання, камбінавання (гл. адпаведныя арт.), рэканструкцыя дзейных прадпрыемстваў, іх расшырэнне і тэхн. перазбраенне, навук. арганізацыя працы і кіравання. Для інтэнсіфікацыі с.-г. вытворчасці найважн. значэнне маюць механізацыя, электрыфікацыя і хімізацыя вытворчасці, тэхн. ле перааснашчэнне, вывядзенне высокапрадукцыйных сартоў с.-г. культур і парод жывёлы, навук. арганізацыя вытворчасці і кіравання. Ў. в. паскарае тэмпы росту вытворчасці прадукцыі, нац. даходу, павышае фондааддачу, рэнтабельнасць прадпрыемстваў. У БССР за 1966—70 капіталаўкладанні ў прамысловасць павялічыліся ў 2 разы, у с. гасп. ў 1,8 раза, гадавыя тэмпы прыросту прамысл. прадукцыі склалі 12,4%, прадукцыйнасці працы 6,8% у параўнанні (адпаведна) в 10,5% і 4,7% у 1961—65. У с. гасп. рэспублікі тэмпы прыросту валавой прадукцыі за 1966—70 склалі 5% у параўнанні в 3,4% у 1961—65. У 1971—75 у с. гасп. СССР намечана ўкласці 129 млрд. руб., або столькі ж, як за дзве папярэднія пяцігодкі разам узятыя. У БССР дзяржк. капіталаўкладанні ў с. гасп. паводле плана складуць 3,5 млрд. руб., што ў 1,2 раза больш, чым укладзена ў гэтую галіну за апошнія 15 гадоў (1956—70). С. гасп. рэспублікі ў 1971—75 намечана паставіць 75 тыс. трактароў, 20 тыс. збожжаўборачных камбайнаў, 43 тыс. грузавых аўтамабіляў, 9,4 тыс. экскаватараў і бульдозераў, шмат інш. тэхнікі. На аснове мерапрыемстваў па інтэнсіфікацыі с. гасп. ў 9-й пяцігодцы запланавана валавую вытворчасць мяса ў калгасах і дзяржгасах павялічыць у 1,5 раза, малака ў 1,4, лец у 1,8 раза, валавы збор збожжа да 1975 давесці да 7 млн. *т* пры сярэдняй ураджайнасці 27—28 ц з гектара.

Літ.: Ленін У. І. Развіццё капіталізму ў Расіі, Тв., т. 3 (Полн. собр. соч., т. 3); Яго ж. Аграрнае пытанне і «крытыкі Маркса», Тв., т. 13 (Полн. собр. соч., т. 5); Хейнман С. А. Проблемы интенсификации промышленного производства, М., 1968; Матэрыялы XXVII з'езда Камуністычнай партыі Беларусі, Мн., 1971; Матэрыялы XXIV з'езда КПСС, Мн., 1971.

В. Р. Крастоўскі, В. С. Маўрышчаў. Мінск.

ІНТЭРБАЧАННЕ, міжнар. тэлевізійнае аб'яднанне, засн. ў 1960 у Празе. Аб'ядноўвае тэлевіз. службы Балгарыі, БССР, Венгрыі, ГДР, Латв. ССР, Літ. ССР, Малд. ССР, Польшчы, Румыніі, Славакіі, Сав. Саюза, УССР, Фінляндыі, Чэхаславакіі, Эст. ССР; са статутам назіральнікаў — тэлевіз. арг-цыі Аўстрыі, Манголіі, Швецыі, Югаславіі; з'яўляецца састаўной часткай *Міжнароднай арганізацыі радыёвяшчання і тэлебачання.* Кіруючы орган — Савет І. У сваёй дзейнасці І. кіруецца прынцыпамі інтэрнацыяналізму, барацьбы за мір і сацыяльны прагрэс, добраахвотнага і раўнапраўнага супрацоўніцтва. Мае на мэце садзейнічаць азнаямленню з жыццём, гісторыяй і культурай народаў розных краін. Наладжвае прамыя міжнар. трансляцыі тэлевіз. перадач з месцаў важных культ.-палітычных, спарт. падзей, вядзе абмен актуальнымі праграмамі, муз. запісамі, тэлефільмамі і сумесную падрыхтоўку праграм. Выкарыстоўвае дасягненні касмічнай сувязі, каляровае тэлебачанне. Наладзіла сувязі з іншымі міжнароднымі тэлевізійнымі аб'яднаннямі, у т. л. з *Еўрабачаннем.* Цэнтр І.— Прага (Чэхаславакія).

Літ.: Иванов Г. Интервидение, «Советское радио и телевидение», 1970, № 1; Радиовещание и телевидение за рубежом, М., 1969.

М. Ф. Дубянецкі. Мінск.

ІНТЭРВАЛ у музыцы і акустыцы (лац. intervallum адлегласць, прамежак), суадносіны двух гукаў па іх вышыні (па колькасці ваганняў гэтых гукаў, па даўжыні іх гукавых хваляў). Гукі, узятыя паслядоўна, утвараюць меладычны І., адначасова — гарманічны І.

Назву І. вызначае колькасць ахопленых ступеняў, велічыня яго вымяраецца ў тэорыі музыкі колькасцю тонаў і паўтонаў (гл. табліцу), у акустыцы — суадносінамі колькасці ваганняў гукаў. І., большыя за актаву, разглядаюцца як сума актавы і простага І.; кожны з іх мае назву (нона, дэцыма, ундэцыма, дуадэцыма, тэрцдэцыма, квартдэцыма, квінтдэцыма). Па характары гучання І. падзяляюцца на *кансанансы* і *дысанансы.*



1



2



3



4



5



6

Інтэр'ер.

1. Зала з'ездаў Дома ўрада БССР у Мінску. 1930—33.
2. Вялікая чытальная зала гал. корпуса Дзярж. бібліятэкі БССР імя Леніна ў Мінску. 1930—32.
3. Парадная лесвіца Нясвіжскага замка. 2-я пал. 18 ст.
4. Вестыбюль і галерэі Дзярж. маст. музея БССР у Мінску. 1957.
5. Зала рэстарана «Журавінка» ў Мінску. 1969.
6. Верхняе фае Бел. тэатра оперы і балета ў Мінску. 1935—38.


1


2


3


4


5


6


7


8

Іран.

1. Горы Эльбурс. Патухлы вулкан Дэмавенд.
2. Тэгеран. Цэнтральная вуліца.
3. Востраў Харк (Персідскі заліў). Нафтахімічны завод.
4. Збор чайнага лісту ў астане Гілян.
5. Ісфахан. Жылы квартал.
6. Вежавы маўзалей у Гамбедэ-Кабусе. 1006.
7. Рэза Абасі. Жаночая фігура. 1629. Прыватныя зборы.
8. Саборная мячэць у Ісфахане. 9—20 ст.

Табліца інтэрвалаў асноўнага гукараду

Назва інтэрвалу, скарочанае напісанне	Колькасць ступеняў	Колькасць тонаў	Прыклады (ад гука «до»)
Чыстая прыма (ч. 1)	1	0	до — до
Малая секунда (м. 2)	2	½	до — ре-бемоль
Вялікая секунда (в. 2)	2	1	до — ре
Малая тэрцыя (м. 3)	3	1½	до — мі-бемоль
Вялікая тэрцыя (в. 3)	3	2	до — мі
Чыстая кварта (ч. 4)	4	2½	до — фа
Павялічаная кварта (пав. 4)	4	3	до — фа-дыез
Паменшаная квінта (пам. 5)	5	3	до — соль-бемоль
Чыстая квінта (ч. 5)	5	3½	до — соль
Малая секста (м. 6)	6	4	до — ля-бемоль
Вялікая секста (в. 6)	6	4½	до — ля
Малая септыма (м. 7)	7	5	до — сі-бемоль
Вялікая септыма (в. 7)	7	5½	до — сі
Чыстая актава (ч. 8)	8	6	до — до¹

ІНТЭРВЕНЦЫЯ (лац. intervento умяшанне), насільнае ўмяшанне адной дзяржавы ва ўнутраныя справы другой. Груба парушае суверэнітэт дзяржавы і супярэчыць статуту ААН. Адрозніваюць І. адкрытую (ваенную) і скрытую (эканамічную, юрыдычную і інш.). Паглыбленне агульнага крызісу капіталізму, абвастрэнне яго супярэчнасцей узмацняюць авантурызм імперыялізму, які ўсё часцей шукае выйсця ў ваен. правакацыях, змовах і прамых ваен. актах (І. ЗША ў Карэі, Паўд. В'етнаме, Камбоджы і Лаосе). Імперыялісты. краіны шырока выкарыстоўваюць скрытую І. для вакабалення краін, якія сталі на шлях развіцця, і задушэння нац.-вызв. руху. СССР і інш. сацыялісты. краіны асуджаюць усе віды І. і праводзяць палітыку неўмяшання ва ўнутраныя справы інш. дзяржаў. Гл. таксама *Грамадзянская вайна і ваенная інтэрвенцыя ў СССР 1918—20.*

ІНТЭРВ'Ю (англ. interview), прызначаная для друку, радыё, тэлебачання гутарка паліт., грамадскага ці інш. дзеяча з журналістам. Мае на мэце выказаць думку гэтага дзеяча па пытаннях міжнар. ці ўнутр. палітыкі, грамадска-паліт. жыцця, навукі, мастацтва і інш. Гл. таксама *Жанры газетныя.*

ІНТЭРГЛЯЦЫЯЛ, тое, што *міжледавікоўе.*

ІНТЭР'ЕР (франц. interieur унутраны), 1) у архітэктуры — унутр. прастора будынка. Характар І. залежыць ад яго прызначэння і вызначаецца планіровачнай структурай абудаванняў, ужытымі апрацоўчымі матэрыяламі, дэкаратыўным аздабленнем (роспіс, ляпніна), мэбляй і інш. Сінтэз арх. формаў і манумент.-дэкар. мастацтва стварае ў І. маст. вобраз — асобнае асяроддзе, здольнае выклікаць у чалавека пэўную эмац. рэакцыю (грандыёзныя І. храмаў Ст. Егіпта і сярэдневяковай Еўропы, пышныя залы італьян. палацца эпохі Адраджэння, парадныя І. рус. архітэктуры 18—19 ст.). У сучаснай архітэктуры найб. важнае значэнне набываюць праблемы рацыянальнай і эстэтычна выразнай кампаноўкі І., сувязі яго з навакольным асяроддзем, дыферэнцыраваны падыход да вырашэння разнастайных паводле прызначэння памяшканняў і інш.

Сярод выдатных І. на Беларусі: памяшканні *Спаса-Ефрасіннеўскай царквы* ў Полацку (збераглася фрэскі 12 ст.), езуіцкага касцёла ў Гродне (гал. алтар 1736; гл. *Гродзенскі езуіцкі касцёл і манастыр*), *Магілёўскай Мікалаеўскай царквы* (іканастас 2-й пал. 17 ст.), парадныя залы ў стылі класіцызму *Жыліцкага палаца* (пач. 19 ст.; не збераглісь), *Гомельскага палаца* (І. гал. корпуса, 1785—93), парадная лесвіца Нясвіжскага замка (18 ст.) і інш. Першыя спробы маст. вырашэння І. ў БССР (у Мінску), стварэння сінтэзу архітэктуры, скульптуры і жывапісу адносяцца да 30-х г. [роспісы М. Лебедзевай і барэльефы А. Бембеля ў зале з'ездаў Дома ўрада БССР (1933—34, арх. І. Лангбард); барэльефы Бембеля ў тэатр. зале Акруговага дома афіцэраў (1934—39, арх. Лангбард)]. Вядомы таксама І., створаныя арх. Лангбардам (Бел. т-р оперы і балета), Г. Лаўровым (Дзярж. б-ка БССР імя Леніна), М. Бакланавым (Дзярж. маст. музей БССР). Найб. значныя работы бел. мастакоў у І. 50-х г.— роспіс плафона Т-ра юнага гледача (1955) і пано ў канферэнц-зале Бел. т-ва дружбы і культ. сувязі з заруб. краінамі (маст. І. Ахрэмчык і І. Давідовіч, 1956). У сярэдзіне 60-х г. у І. шырока выкарыстоўваецца мазаіка, металапластыка, кераміка, вітражы, сграфіта. Сярод дэкар.-манумент. работ у сучасным грамадскім І. Мінска найб. значныя: мазаіка з колатых глазураваных плітак у кінатэатры «Партызан» (маст. М. Данцыг і Б. Няпомняшчы, 1966); мазаіка ў рэстаране «Каменная кветка» (маст. Я. Печкін і Няпомняшчы, 1969); контурныя рэльефы на Мінскім гадзіннікавым з-дзе (маст. А. Кашкурэвіч і Я. Зайцаў, 1964); сграфіта ў актавай зале Тэхнал. ін-та і Палаца піянераў і школьнікаў (абодва — маст. Г. Вашчанка і У. Стальмашонак, 1962) і ў кінатэатры «Маяк» (маст. А. Кішчанка і Г. Гаркуноў, 1969); вітраж (маст. І. Рэй і І. Эдэльман, 1968) і каваная рашотка (маст. А. Зайцаў і Л. Кавакоў, 1968) у музеі Вял. Айч. вайны; дэкар. пано і вазы з шамоту ў рэстаране «Журавінка» (1969, арх. А. Ткачук, Н. Шпігельман, маст. Я. Карманаў, У. Кузняцоў). Маст. вырашэнне І. набыло пашырэнне ў грамадз. архітэктуры інш. гарадоў Беларусі (Гомель, Віцебск, Магілёў, Гродна, Брэст). Іл. гл. на ўкл.

2) Асобны жанр у выяўл. мастацтве, які адлюстроўвае ўнутраныя архітэктурныя прасторы — пакоі, залы, анфілады і інш., дасягнуў росквіту ў 17 ст. ў галандскім і фламандскім жывапісе, а ў 19 ст. ў Расіі ў творах мастакоў школы А. Г. Венецыянава. У Дзярж. маст. музеі БССР інтэр'еры К. Зелянцова, С. Жукоўскага і інш.

Літ.: Елатомцева И. М. Монументальная летопись эпохи, Мн., 1969; Ляўхненка Л. Г. Манументальна-дэкаратыўнае мастацтва ў інтэр'ерах грамадскіх будынкаў Беларусі, «Весці АН БССР. Сер. грамадскіх навук», 1969, № 4.

Л. Ляўхненка (інтэр'ер на Беларусі). Мінск.

ІНТЭР'ЕР (*у жывёлы*), індывідуальныя асаблівасці ўнутранай будовы (анатамічнай і гісталагічнай) асобных органаў і тканак с.-г. жывёлы. Аб'екты інтэр'ерных даследаванняў — косці, мышцы, скура, поўсць, залозы, кроў, унутраныя органы жывёл. Паказчыкі І. выяўляюць сувязь паміж будовай органаў і тканак і іх функцыян. дзейнасцю, будовай цела жывёлы і яе прадукцыйнасцю.

Літ.: Эйдригевич Е. В. и Раевская В. В. Интерьер сельскохозяйственных животных, М., 1966.

ІНТЭРМЕДЫЯ (ад лац. intermedius тое, што знаходзіцца пасярэдзіне), 1) у тэатры — кароткая камедыйная п'еса або сцэна, якая выконваецца паміж дзеямі драмы ці оперы. Узнікла ў сярэднія вякі ў містэрыях, пашырана ў школьнай драме, камедыі дэль артэ. У Англіі І. называлі інтэрлюдыямі. З італьян. оперных І. 17—18 ст. развілася опера-буфа. У бел. т-ры вядомы сатырычныя І. школьнай драмы: «Іван і царкоўны вартаўнік», «Чорт Асмалейка», «Селянін у касцёле». І. былі ў рэпертуары батлейкі: «Мацей і доктар», «Франт з паненкаю», «Антон з казою і Антоніха». І. выкарыстоўвалі Е. Міровіч («Машэка», «Каваль-ваявода»), В. Вольскі («Несцерка») і інш.

2) У музыцы — прамежкавы эпізод, які злучае правядзенні тэмы ў фузе.

Літ.: Велецкий А. Старинный театр в России, [т.] 1, М., 1923; Мокульский С. История западноевропейского театра, ч. 1, М., 1936; Хрэстаматыя па старажытнай беларускай літаратуры, Мн., 1959; Невядомыя беларускія творы першай паловы XVIII стагоддзя, «Полымя», 1965, № 9.

ІНТЭРМЕТАЛІЧНЫЯ ЗЛУЧЭННІ (*металіды, металічныя злучэнні*), хім. злучэнні металаў паміж сабою. Адрозніваюцца ад інш. хім. злучэнняў тым, што часта не падпарадкоўваюцца правілам валентнасці. Належаць да злучэнняў з пераважнай *металічнай сувяззю*. Большасць з іх крохкія, цвёрдыя матэрыялы, паводле хім., фіз. і мех. уласцівасцей адрозніваюцца ад чыстых металаў, цвёрдых растворaў і метал. сплаваў.

Бываюць пастаяннага (берталіды) і пераменнага (дальтаніды) саставу. Паводле колькасці хім. элементаў адрозніваюць падвойныя ($CaPt_2$), патройныя (AlMgCu) і складаныя ($NbVTaSn$); паводле асноўнага хім. элементу паз. алюмініды, берыліды і г. д. Паводле прызначэння дзеляцца на гарачатрывалыя матэрыялы ($NiAl$, $TiCr_2$), магнітныя ($FeNi_3$, $MnNi_3$), звышправодныя ($BiPb$, $NbSn_3$), паўправадніковыя ($InSb$, $AlSb$) і інш. Выкарыстоўваюцца ў атамнай энергетыцы, ракетнай і авіяцыйнай тэхніцы, электроніцы, пры стварэнні магутных магнітаў і квантавых генератараў.

Літ.: Савицкий Е. М. и др. Сплавы редкоземельных металлов, М., 1962; Корнилов И. И. Металлиды и взаимодействие между ними, М., 1964; Интерметаллические соединения, пер. с англ., М., 1970 (бібліягр.).

ІНТЭРМЕЦЦА (італьян. intermezzo літар. перапынак), п'еса прамежкавага значэння ў цыклічнай інструментальнай кампазіцыі (раздзей у оперы) або самастойная інструментальная п'еса свабоднай будовы.

Як асобны від інстр. мініяцюры ўвёў Р. Шуман. Вядомыя І. для фп. І. Брамса, А. Лядава, для арк.— М. Мусаргскага. У бел. музыцы І. для розных інструментаў і арк. стварылі М. Аладаў, А. Багатыроў, Я. Глебаў, А. Туранкоў.

«ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ», міжнародны пралетарскі гімн. Тэкст напісаў у 1871 паэт-камунар Э. Пацье, музыку ў 1888 П. Дэгейтэр. З 1917 «І.» быў гімнам Сав. дзяржавы, у 1944, з прыняццем новага Дзярж. гімна СССР, зацверджаны як гімн КПСС. Тэкст «І.» на бел. мову пераклаў Я. Купала.

Літ.: Ленин В. И. Евгений Потье, Полн. собр. соч., т. 22.

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ 1-ы (*Міжнароднае Таварыства Рабочых*), першая масавая міжнар. арг-цыя пралетарыяту, заснавальнікамі якой былі К. Маркс і Ф. Энгельс. І. 1-ы ўзнік у гады найвышэйшага росквіту дамінапаліст. капіталізму, ва ўмовах уздыму рабочага і агульнадэмакр. руху. Меў на мэце замяніць сацыяліст. і паўсацыяліст. секты сапраўднай арганізацыяй рабочага класа для барацьбы за свае правы. Аб'ядноўваў у адзінай арг-цыі наяўныя сілы рабочага руху 60-х г. 19 ст.: англ. трэд'юніяністаў, франц. пруданістаў, ням. ласальянцаў і інш. з тым, каб у сумеснай барацьбе пераадолець уплыў гэтых сектаў, выпрацаваць адзіную тактыку пралет. класавай барацьбы ў розных краінах.

Заснаваны 28.9.1864 у Лондане на міжнар. мітынгу прадстаўнікоў англ., франц., ням., італьян. і польскіх рабочых з удзелам К. Маркса. На мітынгу выбраны Арганізацыйны Савет (Камітэт), які з 1866 стаў называцца Ген. саветам І. 1-га. К. Маркс напісаў устаноўчы маніфест і статут Міжнар. Таварыства Рабочых. Ен быў аўтарам большасці рэзалюцый, залў і зваротаў Ген. савета. У гэтых дакументах выкладзены ў агульнай форме асн. палажэнні навук. камунізма, карэнныя пытанні тактыкі рабочага руху. Да 1872 Ген. савет знаходзіўся ў Лондане, потым у Нью-Йорку. У кожнай краіне І. 1-ы апіраўся на рабочыя арг-цыі, якія станавіліся секцыямі І. 1-га. Секцыі існавалі ў Вялікабрытаніі, Ірландыі, Германіі, Францыі, Італіі, Іспаніі, Партугаліі, Бельгіі, Галандыі, Даніі, Аўстрыі, Венгрыі, Швейцарыі, Польшчы, ЗША, Аўстраліі; у 1870 у Жэневе створана руская секцыя 1-га Інтэрнацыянала, якая выбрала сваім прадстаўніком у Ген. савеце К. Маркса. За час існавання І. 1-га адбыліся кангрэсы Жэнеўскі (1866), Лазанскі (1867), Брусельскі (1868), Базельскі (1869), Гаагскі (1872), некалькі канферэнцый. На пасяджэннях Ген. савета і асобных секцый, на кангрэсах і канферэнцыях І. 1-га выкрывалася неабгрунтаванасць, нежыццяздольнасць сектанскіх вучэнняў, распрацоўвалася адзіная тактыка класавай барацьбы пралетарыяту. І. 1-ы садзейнічаў разгрому пруданізму ў Францыі, паражэнню ласальянцаў і ўтварэнню ў Германіі С.-д. рабочай партыі (1869), ідэйна разграміў анархізм М. А. *Бакуніна* і арганізацыйна размежаваўся з ім.

І. 1-ы выхоўваў міжнар. пралетарскую салідарнасць, даваў рабочым праграму канкрэтнай дзейнасці (барацьба за 8-гадзінны рабочы дзень, ахова працы жанчын, стварэнне прафсаюзаў і інш.), падтрымліваў стачачную барацьбу і г. д. Садзейнічаў барацьбе англ. рабочых за ўсеагульнае выбарчае права, выступаў у абарону польскага і ірл. нац.-вызв. руху, выпрацоўваў тактыку пралетарыяту ў адносінах да вайны, рашуча падтрымліваў *Парыжскую камуну 1871*. Пасля паражэння Парыжскай камуны, ва ўмовах паліт. рэакцыі і паліцэйскага тэрору, абвастрэння рознагалоссяў з апартуністамі, далейшае існаванне І. 1-га стала нямэтазгодным. Фактычна І. 1-ы скончыў сваю дзейнасць рашэннямі Лонданскай канферэнцыі (1871) і Гаагскага кангрэсу (1872) пра неабходнасць стварэння ў кожнай краіне самастойнай паліт. партыі пралетарыяту. Фармальна распушчаны ў 1876 рашэннем канферэнцыі ў Філадэльфіі. «Першы Інтэрнацыянал (1864—1872) заклаў фундамент міжнароднай арганізацыі рабочых для падрыхтоўкі іх рэвалюцыйнага націску на капітал» (Ленін У. І. Тв., т. 29, с. 280). Ён расчысціў шлях для пашырэння марксізма, залажыў асновы для стварэння партый рабочага класа. Яго пераемнікам і прадаўжальнікам стаў *Камуністычны Інтэрнацыянал* і сучасны камуніст. рух. На Беларусі дакументы І. 1-га разам з іншай марксісцкай л-рай з'явіліся ў сярэдзіне 70-х г. 19 ст. Адным з відных дзеячаў рускай секцыі І. 1-га быў удзельнік паўстання 1863—64 на Беларусі А. Д. Трусаў.

Кр.: Генеральный Совет Первого Интернационала. Протоколы, [т. 1—5], М., 1961—65.

Літ.: Первый Интернационал, ч. 1—3, М., 1964—68; Штенберг Б. С. Первый Интернационал и революционная Россия, М., 1964; Смирнов А. Ф. Первый Интернационал, Мн., 1964; Тагиров Р. Ш. Русская и советская историография Первого Интернационала, ч. 1, Казань, 1968; Фостер У. З. История трех Интернационалов, пер. с англ., М., 1959; Датт Палм Р. Интернационал. Очерк истории коммунистического движения. 1848—1963, пер. с англ., М., 1966. *В. І. Розін.* Мінск.

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ 2-і, міжнар. аб'яднанне рабочых партый, заснаванае ў 1889 пад ідэйным кіраўніцтвам Ф. Энгельса. Стварэнне І. 2-га падрыхтавана ўсім ходам развіцця рабочага руху ў 70—80-я г. 19 ст., калі ідэйна перамог марксізм, у некат. краінах узніклі самастойныя пралет., сацыяліст. партыі, умацаваліся інтэрнац. сувязі і салідарнасць пралетарыяту. Карэнныя пытанні міжнар. рабочага руху разглядаліся на кангрэсах І. 2-га. Адбылося 9 кангрэсаў: Парыжскі (1889), Брусельскі (1891), Цюрыхскі (1893), Лонданскі (1896), Парыжскі (1900), Амстэрдамскі (1904), Штутгарцкі (1907), Капенгагенскі (1910), Базельскі (1912). У рабоце Цюрыхскага кангрэсу ўдзельнічаў Ф. Энгельс, у рабоце Штутгарцкага і Капенгагенскага — У. І. Ленін. І. 2-і выканаў у гісторыі вызв. руху пралетарыяту некаторую станоўчую ролю: садзейнічаў выкрыццю анархізму і рэфармізму, распаўсюджванню марксізма, выпрацоўцы стратэгіі і тактыкі рэвалюц. барацьбы рабочага класа, выступаў за паляпшэнне жыццёвага ўзроўню працоўных. У. І. Ленін адзначаў, што І. 2-му належыць гістар. заслуга, а іменна: «стварэнне масавых рабочых арганізацый, кааператыўных, прафесіянальных і палітычных, скарыстанне буржуазнага парламентарызма, як і ўсіх наогул устаноў буржуазнай дэмакратыі і т. п.» (Тв., т. 29, с. 467).

У перыяд пераходу капіталіст. гр-ва да імперыял. стадыі развіцця ў І. 2-м пачалі пераважаць апартуністычныя тэндэнцыі, якія асабліва ўзмацніліся пасля смерці Ф. Энгельса (1895). Лідэры І. 2-га (Э. Бернштэйн, Э. Вандэрвельдэ, К. Каўцкі і інш.) зрабілі рэвізію асн. палажэнняў марксізма, выступілі супраць барацьбы за дыктатуру пралетарыяту, вылучылі тэорыю затухання класавай барацьбы пры капіталізме, чым стрымлівалі рэвалюц. актыўнасць рабочага класа. Апартунізм лідэраў І. 2-га прадвызначыў яго непазбежны крах. Хаця ва ўмовах актывізацыі рэвалюц. руху рабочага класа І. 2-і прыняў рэзалюцыі супраць імперыял. вайны (на Штутгарцкім, Капенгагенскім і асабліва на Базельскім кангрэсе, гл. *Базельскі маніфест 1912*), з пачаткам 1-й сусв. вайны апартуніст. кіраўніцтва партый І. 2-га большасці краін, што ўдзельнічалі ў вайне, здрадзіла інтэрнац. салідарнасці працоўных, справе сацыялізма, здрадзіла класавым рэзалюцыям, прынятым у Штутгарце і Базелі. Яно скацілася на пазіцыі нац. шавінізму, падтрымала «свае» ўрады ў вайне і заклікала народы валяць да канчатковай перамогі, тым самым перайшло ў лагер імперыял. буржуазіі. Як адзінае аб'яднанне І. 2-і з пачаткам 1-й сусв. вайны фактычна перастаў існаваць. Сувязі паміж партыямі розных краін спыніліся. Лідэры І. 2-га варожа сустрэлі перамогу Вял. Кастр. сацыяліст. рэв., падтрымалі ўзбр. інтэрвенцыю супраць Сав. Расіі. Пасля 1-й сусв. вайны яны прыклалі намаганні, каб аднавіць І. 2-і, які з 1923 атрымаў назву Сацыялістычнага рабочага інтэрнацыянала. Аднаўлены І. 2-і праводзіў варожую СССР палітыку, шкодзіў адзінству дзеянняў рабочага класа, барацьбе супраць фашызму і вайны. З пачаткам 2-й сусв. вайны спыніў існаванне як міжнар. цэнтр. У 1951 частка сацыяліст. партый аб'ядналася ў *Сацыялістычны інтэрнацыянал*.

З усіх партый І. 2-га толькі партыя бальшавікоў на чале з У. І. Леніным паслядоўна адстойвала жыццёвыя інтарэсы рабочага класа і ўсіх працоўных, прынцыпы пралет. інтэрнацыяналізму, з самага пачатку 1-й сусв. вайны рашуча асудзіла яе як вайну імперыял., заклікала рабочы клас ператварыць яе ў вайну супраць капіталіст. ладу. Яна стала цэнтрам аб'яднання левых, сапраўды рэвалюц. элементаў у міжнар. рабочым руху (гл. *Цымервальдская канферэнцыя, Кінтальская канферэнцыя*). Пасля перамогі Вял. Кастр. сацыяліст. рэв. ва ўмовах уздыму сусв. рэвалюц. руху сталі складвацца ў асобных краінах камуніст. партыі, якія заснавалі ў сак. 1919 трэці, *Камуністычны Інтэрнацыянал*.

Літ.: Ленін У. І. Крах II Інтэрнацыянала, Тв., т. 21 (Полн. собр. соч., т. 26); яго ж. Апартунізм і крах II Інтэрнацыянала, Тв., т. 21—22 (там жа, т. 27); яго ж. Імперыялізм і раскол сацыялізма, Тв., т. 23 (там жа, т. 30); яго ж. Аб задачах III Інтэрнацыянала, Тв., т. 29 (там жа, т. 39); История Второго Интернационала, т. 1—2, М., 1965—66; Борьба за мир. Материалы трех Интернационалов, М., 1967; Кривогуз И. М. Второй Интернационал. 1889—1914, М., 1964; Фостер У. З. История трех Интернационалов, пер. с англ., М., 1959; Датт Палм Р. Интернационал. Очерк истории коммунистического движения. 1848—1963, пер. с англ., М., 1966.

А. І. Самаль. Мінск.

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ 3-і, гл. *Камуністычны Інтэрнацыянал*.

«ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ 4-ы», назва, дадзеная міжнар. аб'яднанню трацкісцкіх элементаў, якое створана ў 1938 з рэшткаў «левых» адшчапенцаў — прыхільнікаў Л. Д. Троцкага, выключаных з камуніст. партый. Варожае да кампартый, якія стаяць на пазіцыях марксізма-ленінізма. Мае арг-цыі і групы ў многіх капіталіст. краінах, асабліва ў Зах. Еўропе і Лац. Амерыцы. Расколата на некалькі груповак. Кожная з іх прэтэндуе на першынство і права называцца «І. 4-м», аднак усіх іх яднае агульная рыса — антыкамунізм і антысаветызм. Трацкісты прыкрываюцца левымі фразамі, а фактычна барацьбу супраць імперыялізму падменьваюць барацьбою супраць авангардных сіл сусв. рэвалюц. руху, адмаўляюць прынцып мірнага суіснавання дзяржаў з рознымі сац. сістэмамі, зняважліва ставяцца да рэвалюц. ролі нар. мас. Дзейнасць «І. 4-га» не мае падтрымкі сярод рабочага класа. Таму трацкісты робяць стаўку на паліт. незагартаваную частку студэнцтва, штурхаюць моладзь на анарха-авантурыстычныя ўчынкі.

Літ.: Гл. пры арт. *Трацкізм*.

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІЗМ пралетарскі (ад лац. inter паміж+natio народ), навукова

абгрунтаваная ідэалогія і палітыка міжнар. адзінства, братняга саюзу, згуртаванасці дзеянняў рабочага класа, яго партый, усіх працоўных у барацьбе за звяржэнне капіталізму і пабудову камунізма, за нацыянальнае раўнапраўе і незалежнасць народаў, дэмакратыю і сацыяльны прагрэс. Аснова пралет. І.— агульныя карэнныя класавыя інтарэсы і мэты працоўных усіх краін і нацый у барацьбе за сац. і нац. вызваленне. Прынцыпы пралет. І. і яго роля ў рэвалюц. працэсе ўсебакова абгрунтаваны заснавальнікамі марксізма-ленінізма. К. Маркс і Ф. Энгельс у «Маніфесце Камуністычнай партыі» абвясцілі лозунг «Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!», які з'яўляецца баявым дэвізам сусв. рабочага і камуніст. руху. Велізарная роля ў аб'яднанні пралет. арг-цый шэрагу краін належала створанаму імі *Інтэрнацыяналу 1-му*. Ідэі і прынцыпы рэвалюц. І. творча распрацаваны У. І. Леніным, у дакументах камуніст. і рабочых марксісцка-ленінскіх партый. Ленінская канцэпцыя пралет. І. выходзіць з аб'ектыўных заканамернасцей развіцця класавых і нац. узаемаадносін у эпоху імперыялізму. У гэтых умовах павялічваюцца магчымасці збліжэння нац.-вызв. руху з рэвалюц. барацьбой рабочага класа супраць капіталізму. Ленінскі лозунг «Пралетарыі і прыгнечаныя народы, яднайцеся!» стаў сцягам вызв. барацьбы нар. мас супраць імперыялізму. Міжнар. рабочы рух, верны ідэям Маркса — Энгельса — Леніна, выпрацаваў новы лозунг, які адпавядае сучаснаму паняццю пралет. І. «Народы сацыялістычных краін, пралетарыі, усе дэмакратычныя сілы ў краінах капіталу, народы, якія вызваліліся, і прыгнечаныя,— аб'ядноўвайцеся ў агульнай барацьбе супраць імперыялізму, за мір, нацыянальную незалежнасць, сацыяльны прагрэс, дэмакратыю і сацыялізм!» (Да 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна. Тэзісы ЦК КПСС, Мн., 1969, с. 42).

Сутнасць пралет. І. вызначаецца агульнымі інтарэсамі рабочага класа з улікам канкрэтных задач рэвалюц. барацьбы на кожным этапе яе развіцця. У перыяд даманапалістычнага капіталізму функцыі І. абмяжоўваліся згуртаваннем пралет. сіл і арганізацыяй сумесных выступленняў рабочых для падтрымкі і развіцця агульнадэмакр. і нац.-вызв. рэвалюцый. У эпоху імперыялізму пралет. І. становіцца магутнай зброяй звяржэння ўлады буржуазіі і ўсталявання дыктатуры пралетарыяту. Яскравае ўвасабленне ідэй пралет. І.— Кастр. рэвалюцыя, якая палажыла пачатак эпосе крушэння капіталізму і пераходу да сацыялізма. Гэта была перамога не толькі рабочых і сялян Расіі, але і ўсяго сусв. пралетарыяту, які актыўна падтрымліваў сав. народ у ахове яго заваёў, у разгроме аб'яднаных сіл контррэвалюцыі і інтэрвенцыі. СССР паказаў бліскучы ўзор вырашэння нац. пытання ў духу пралет. І., добраахвотнага аб'яднання сав. рэспублік у адзінай шматнацыянальнай дзяржаве, у якой гарманічна спалучаюцца нац. і інтэрнац. інтарэсы ўсіх нацый і народнасцей. Велізарныя дасягненні народаў Сав. Саюза, у т. л. і беларускага,— вынік не толькі ўласных намаганняў, але і іх супрацоўніцтва і ўзаемадапамогі ва ўсіх галінах грамадскага жыцця. Пасля Кастр. рэвалюцыі пачаўся новы этап у развіцці пралет. І., звязаны з пераўтварэннем грамадскага жыцця на сацыяліст. асновах. У сацыяліст. краіне І. рабочага класа пераўтварыўся ў сацыяліст. І., у агульнанар. ідэалогію братняй дружбы і супрацоўніцтва сацыяліст. нацый і народнасцей, аб'яднаных у адзінай шматнацыянальнай Сав. дзяржаве. З выхадам сацыялізма за рамкі адной краіны сацыяліст. І. атрымаў далейшае ўвасабленне і развіццё ў новым тыпе дзярж. узаемаадносін народаў сусв. сістэмы сацыялізма, пабудаваных на аснове поўнага раўнапраўя, нац. незалежнасці і суверэнітэту, неўмяшання ва ўнутраныя справы адзін аднаго, братняй узаемадапамогі і супрацоўніцтва. Вернасць прынцыпам сацыяліст. І. выяўляецца ў ажыццяўленні макс. намаганняў камуніст. партый і народаў сацыяліст. краін у пабудове сацыялізма і камунізма, у падтрымцы рэвалюц. барацьбы рабочага класа ў капіталіст. краінах, у салідарнасці і дапамозе народам, якія змагаюцца за нац. свабоду, незалежнасць, ва ўмацаванні адзінства міжнар. камуніст. руху, рашучай барацьбе з усякага роду фракцыянерамі, раскольнікамі, з рэвізіянізмам і дагматызмам. Яркім праяўленнем І. з'яўляецца ўсебаковая падтрымка Сав. Саюзам і інш. сацыяліст. краінамі вызв. барацьбы народаў Індакітая супраць агрэсіі ЗША, а таксама барацьбы араб. народаў супраць ізраільскай агрэсіі. Пралет. І. непрымірымы з бурж. *нацыяналізмам*, які з'яўляецца ідэалогіяй і палітыкай нац. варожасці, прыгнёту і мае на мэце зацямніць класавую свядомасць працоўных, раз'яднаць іх у барацьбе супраць эксплуататарскіх класаў. Спекулюючы на нац. пачуццях, буржуазія імкнецца выдаць свае інтарэсы за народныя, а на справе прадае інтарэсы свабоды, радзімы і нацыі. У крайнім сваім выяўленні нацыяналізм перарастае ў ваяўнічы *шавінізм* з яго рэакц. ідэямі нац. выключнасці і перавагі адных нацый над іншымі, расавай дыскрымінацыі, сусв. панавання. Вялікай пагрозай пралет. І. ў сучасны момант з'яўляецца *сіянізм*. Інтэрнац. адзінству рабочага класа шкодзіць дзейнасць т. зв. *Сацыялістычнага інтэрнацыянала*. Сацыяліст. І. непарыўна звязаны з патрыятызмам і адданасцю сваёй Радзіме, усёй садружнасці сацыяліст. нацый. Абарона сацыялізма — інтэрнац. абавязак камуністаў і працоўных усіх краін і нацый. Камуніст. партыя і сав. народ бачаць свой патрыят. і інтэрнац. абавязак у паспяховым ажыццяўленні планаў камуніст. буд-ва, ва ўмацаванні адзінства краін сацыяліст. садружнасці і ўсяго сусв. рэвалюц. руху, у ахове свабоды і бяспекі народаў, у згуртаванні антыімперыялістычных сіл у барацьбе за мір і сац. прагрэс. «Інтэрнацыяналізм на справе — адзін і толькі адзін: самаадданая работа над развіццём рэвалюцыйнага руху і рэвалюцыйнай барацьбы ў сваёй краіне, падтрыманне (прапагандай, спачуваннем, матэрыяльна) такой жа барацьбы, такой жа лініі, і толькі яе адной, ва ўсіх без выключэння краінах» (Ленін У. І. Тв., т. 24, с. 53).

Літ.: Маркс К., Энгельс Ф. и Ленин В. И. О пролетарском интернационализме, 2 изд., М., 1968; Ленин В. И. Вопросы национальной политики и пролетарского интернационализма, М., 1965; Под знаменем пролетарского интернационализма, М., 1957; Программные документы коммунистических и рабочих партий капиталистических стран Европы, М., 1960; Праграма Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Мн., 1961; Дакументы міжнароднай Нарады камуністычных і рабочых партый. Масква, 5—17 чэрвеня 1969 года, Мн., 1969; Да 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна. Тэзісы ЦК КПСС, Мн., 1969; Матэрыялы XXIV з'езда КПСС, Мн., 1971; Брэжнеў Л. І. Пяцьдзесят гадоў вялікіх перамог сацыялізма, Мн., 1967; Платонов Р. и Смирнов Ю. Верность интернациональному долгу, Мн., 1970; Серова И. И. О пролетарском интернационализме, Мн., 1970.

І. М. Ільюшын. Мінск.

ІНТЭРНАЦЫЯНА́ЛЬНАЕ ВЫХАВА́ННЕ (ад лац. inter паміж+natio народ), выхаванне працоўных у духу пралетарскага інтэрнацыяналізму, пачуцця дружбы паміж народамі СССР, пралет. салідарнасці і павагі да працоўных усіх краін, незалежна ад іх нацыянальнасці. Пралет. інтэрнацыяналізм заснаваны на павазе да нац. гордасці і дзярж. суверэнітэту кожнай нацыі. І. в.— важнейшая частка *камуністычнага выхавання*. Зыходзіць з адзінства нац. і інтэрнац. задач

працоўных, непарыўна звязана з выхаваннем сацыяліст. патрыятызму (гл. *Ваенна-патрыятычнае выхаванне*).

І. в. дзяцей у Сав. Саюзе пачынаецца з дашкольных гадоў у сям'і, у дзіцячых дашкольных установах, ажыццяўляецца ў працэсе ўзаемаадносін дзяцей розных нацыянальнасцей. І. в. пранізвае ўвесь працэс навучання ў сав. школе. Вучні знаёмяцца з гісторыяй, жыццём, культурай народаў СССР і замеж. краін. Вывучэнне гісторыі сумеснай барацьбы народаў супраць эксплуататараў і каланізатараў, супраць захопніцкіх войнаў і мілітарысцкай палітыкі імперыял. дзяржаў выхоўвае ў навучэнцаў перакананне ў неабходнасці міжнар. салідарнасці пралетарыяту, імкненне памагчы прыгнечаным народам у іх вызв. барацьбе. У курсе грамадазнаўства вывучаюцца прынцыпы марксісцка-ленінскай нац. палітыкі Камуніст. партыі і Сав. дзяржавы. Сумесная і раўнапраўная праца сав. людзей розных нацыянальнасцей, ідэйна-выхаваўчая работа, якую праводзіць Камуніст. партыя сярод працоўных, выхоўваюць сав. людзей у духу сацыяліст. *інтэрнацыяналізму*. У рэспубліцы вял. значэнне ў І. в. моладзі маюць гутаркі, лекцыі і палітінфармацыі на міжнар. тэмы, інтэрнац. ранішнікі і вечары, клубы і куткі інтэрнац. дружбы, школьныя музеі баявой і працоўнай славы сав. народа, экспазіцыі, якія паказваюць удзел прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей у вызваленні Беларусі ад ням.-фаш. захопнікаў, у аднаўленні і развіцці яе нар. гаспадаркі.

Карэнныя эканам., сацыяльныя і паліт. пераўтварэнні ў СССР прывялі да вырашэння нац. пытання ў краіне, да перамогі ідэалогіі інтэрнацыяналізму. Статут КПСС патрабуе ад сваіх членаў быць актыўнымі праваднікамі ідэй сацыяліст. інтэрнацыяналізму і сав. патрыятызму ў масы працоўных, весці барацьбу з перажыткамі нацыяналізму і шавінізму, садзейнічаць умацаванню дружбы народаў СССР, брацкіх сувязей сав. народа з народамі краін сацыяліст. лагера, з пралетарыямі і працоўнымі ўсіх краін. У Сав. Саюзе ажыццёўлена маральна-паліт. адзінства ўсіх сав. народаў, аб'яднаных у 15 суверэнных нац. рэспублік. Сав. дзяржава памагае і падтрымлівае народы краін, якія змагаюцца за нац. незалежнасць, супраць эксплуатацыі і каланіялізму. Моладзь у імперыял. краінах, асабліва ў ЗША, выхоўваецца ў духу бурж. нацыяналізму, расавай дыскрымінацыі і зняважы да інш. народаў.

М. Г. Агурцоў. Мінск.

ІНТЭРНАЦЫЯНА́ЛЬНАЯ ЛЕ́КСІКА (інтэрнацыяналізмы), словы і выслоўі, засвоеныя як тэрміны трыма і больш несваяцкімі мовамі для перадачы паняццяў з розных галін навукі, тэхнікі, эканомікі, культуры і інш. І. л. пераважна запазычана з грэч. і лац. моў («атам», «тэатр», «акт», «культура») ці ўтворана на аснове іх марфалаг. элементаў («алфавіт», «аўтамабіль», «тэлефон»). Інтэрнац. сталі многія словы з англ., ням., франц., італьян. моў. У бел. мову І. л. пачала пранікаць у 16—17 ст. і асабліва пашырылася (у асн. праз рус. мову) пасля Кастр. рэвалюцыі, калі Беларусь набыла сав. дзяржаўнасць і выйшла на арэну паліт., эканамічнага і культурнага жыцця. У наш час мовы свету актыўна папаўняюцца словамі з рускай мовы («большевик», «совет», «спутник»).

ІНТЭРНАЦЫЯНА́ЛЬНЫЯ БРЫГА́ДЫ, баявыя інтэрнац. злучэнні, якія змагаліся на баку іспанскай рэспублікі ў перыяд нац.-рэвалюц. вайны іспанскага народа 1936—39. Каля 35 тыс. добраахвотнікаў — антыфашыстаў, людзей розных паліт. кірункаў і сац. становішча з 54 краін, у т. л. з СССР, прыбылі ў Іспанію, каб памагчы ісп. народу адстаяць свабоду і незалежнасць. Было сфарміравана 7 брыгад (11-я, 12-я, 13-я, 14-я, 15-я, 129-я, 150-я), якія ўдзельнічалі ў гал. бітвах вайны — у абароне Мадрыда, у баях на рэках Харама, Эбра, у раёне Гвадалахары. У 1937 у 13-й брыгадзе была створана ўкр.-бел. рота імя Т. Шаўчэнкі. У радах камуністаў-інтэрнацыяналістаў супраць фашызму ў рэсп. Іспаніі змагаліся беларусы К. П. *Арлоўскі*, С. А. *Ваўпшасаў*, С. І. *Грыцавец*, М. М. *Дворнікаў*, В. З. *Корж* і інш. Сярод арганізатараў і кіраўнікоў І. б. відныя дзеячы міжнар. рабочага руху П. *Тальяці*, Л. *Лонга*, П. Нэні, М. *Залка*, Ф. *Мюніх*, К. *Свярчэўскі* і інш. У кастр. 1938 па рашэнні рэсп. ўрада І. б. эвакуіраваны з Іспаніі. Барацьба байцоў І. б. у Іспаніі — выдатны прыклад міжнар. салідарнасці дэмакр. антыфашысцкіх сіл.

Літ.: Интернациональная бригада, М., 1937; Гарсиа Х. Интернациональные бригады в Испании (1936—1938 гг.), «Вопросы истории», 1956, № 7; Листер Э. Против фальсификации некоторых вопросов национально-революционной войны в Испании, «Новая и новейшая история», 1961, № 4; Лонго Л. Интернациональные бригады в Испании, пер. с итальян., М., 1960.

ІНТЭРНІ́РАВАННЕ (ад лац. internus унутраны), прымусовае затрыманне і раззбраенне нейтральнай дзяржавай на сваёй тэрыторыі вайсковых часцей дзяржаў, якія ваююць, або затрыманне і пасяленне ў спец. месцах уладамі дзяржаў, што ваююць, непрыяцельскіх грамадзян, якія жывуць на іх тэрыторыях, да заканчэння вайны.

Рэжым ваеннапалонных, а таксама непрыяцельскіх грамадзян (некамбатантаў) вызначаецца *Жэнеўскай канвенцыяй* 1949 пра абарону цывільнага насельніцтва ў час вайны і *Гаагскімі канвенцыямі* 1907. Пасля заканчэння ваен. дзеянняў ці акупацыі інтэрніраваным грамадзянам і ваеннаслужачым павінна быць аказана садзейнасць у вяртанні на месца іх ранейшага пражывання. Імперыял. дзяржавы часта парушаюць нормы міжнар. права пра І.

М. М. Авакаў. Мінск.

ІНТЭРПАЛЯ́ЦЫЯ (у матэматыцы), знаходжанне прамежкавых значэнняў матэм. аб'ектаў па некат. вядомых у асобных пунктах яго характарыстыках.

Пад І. першапачаткова разумелі пабудову функцыі $f(x)$ у выглядзе лінейнай камбінацыі зададзеных функцый $\varphi_k(x)$ — інтэрпаляцыйнага мнагачлена $f(x)=\sum_{k=1}^{n} a_k \varphi_k(x)$, які прымае значэнні $y_i=f(x_i)$ у фіксаваных пунктах (вузлах І.) $x_i (i=0, 1, \ldots, n)$, і вылічэнне значэнняў функцыі $f(x)$ у адвольных пунктах, якія знаходзяцца паміж вузламі x_0 і x_n [калі x знаходзіцца па-за інтэрвалам (x_0, x_n), аналагічная задача наз. *экстрапаляцыяй*]. Пры $\varphi_k(x)=x^k$ інтэрпаляванне наз. алгебраічным. Прасцейшы выпадак алгебраічнага інтэрпалявання — лінейная І., якая вызначаецца формулай: $f(x)=\frac{x-x_i}{x_{i+1}-x_i}\left[f(x_{i+1})-f(x_i)\right]+f(x_i)$ па вузлах x_i і x_{i+1} $(x_i<x<x_{i+1})$. Калі ў аснове ляжаць функцыі $\sin kx$, $\cos kx$, інтэрпаляванне наз. трыганаметрычным. Звычайна, калі значэнняў $y_i=f(x_i)$, атрыманых у выніку назіранняў, шмат, то пры І. кары-

стаюцца *найменшых квадратаў метадам*. Асноўныя пытанні, звязаныя з задачай І. функцыі: высвятленне ўмоў збежнасці інтэрпалявання пры павелічэнні ліку вузлоў, атрыманне ацэнак адхілення інтэрпаляцыйнага многачлена ад функцыі, выбар вузлоў І. з мэтай памяншэння гэтага адхілення. І. выкарыстоўваецца пры пабудове прыбліжаных рашэнняў дыферэнцыяльных, інтэгральных і інш. ураўненняў; у функцыянальным аналізе ажыццяўляецца І. асобных уласцівасцей аператараў; у задачах статыстычнага аналізу значнае месца займае І. выпадковых працэсаў. Гл. таксама *Вылічальная матэматыка, Прыбліжэнне і інтэрпаляванне функцыі*.

Літ.: Гончаров В. Л. Теория интерполирования и приближения функций, 2 изд., М., 1954; Турецкий А. Х. Теория интерполирования в задачах, Мн., 1968.
Л. А. Яновіч. Мінск.

ІНТЭРПЕЛЯЦЫЯ (лац. interpellatio перапыненне прамовы), своеасаблівы від запытання члена парламента да ўрада пра яго агульную палiт. лінію ці дзеянні асобных міністраў.

Ад звычайных запытанняў розніцца тым, што патрабуе адказу асобы, да якой звернута, у вызначаны тэрмін, абмеркавання і прыняцця парламентам рэзалюцыі. Напр., у 1922—30 правам унясення І. шырока карысталіся камуністы — дэпутаты польскага сейма, а таксама пасольскія клубы *Беларускай сялянска-рабочай грамады* (БСРГ) і *«Змагання»*, якія выконвалі функцыі дэпутацкай фракцыі Камуніст. партыі Зах. Беларусі. Скарыстоўваючы трыбуну сейма, БСРГ і «Змаганне» дамагаліся паляпшэння становішча рабочых і сялян, дапамогі галодным, выступалі ў абарону палiт. зняволеных, за стварэнне бел. школ, супраць антынар. аграрнай палітыкі польскага ўрада, супраць абшарнікаў, кулакоў, асаднікаў, падатковага прыгнёту і інш.

Літ.: Інтэрпеляцыі беларускіх паслоў у польскі сойм 1922—1926 гг., Мн., 1927.
І. П. Хайратовіч. Мінск.

ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ (у прыродазнаўстве, матэматыцы, логіцы), прыпісванне значэнняў (сэнсаў) выходным выразам (выказванням, формулам, сімвалам) мовы навукі, што дае магчымасць правяраць усе правільна пабудаваныя выразы ў тых ці іншых тэорыях, фармальных сістэмах і інш.

Адрозніваюць І. эмпірычную, якая вызначае сувязь паміж некат. элементамі сінтаксічнай знакавай сістэмы (тэрмінамі тэорыі) і адпаведнымі фактамі назірання і эксперыменту, і семантычную, калі вызначаюцца значэнні тэрмінаў пэўнай тэорыі на аснове паняццяў другой, больш канкрэтнай (інтэрпрэтаванай) тэорыі. І. мае вял. гнасеалагічнае значэнне пры супастаўленні навук. тэорый з адлюстраванай у іх рэчаіснасцю, пры апісанні розных спосабаў пабудовы тэорыі, яе развіцця і функцыянавання. У логіцы, дзякуючы І., *вылічэнні выказванняў* звязваюцца са змястоўнай логікай і становяцца фармалізаванымі мовамі. Паняцце І. цесна звязана з паняццем «мадэлі», паколькі *мадэляванне* заснавана на падабенстве функцый аб'ектаў рознай прыроды, у тым ліку інтэрпрэтаваных тэорый з апісанымі ў іх аб'ектамі. Гл. таксама *Значэнне і сэнс, Тэорыя*.

Літ.: Крымский С. Б. Интерпретация научных теорий, у кн.: Логика научного исследования, М., 1965; Рубашкин В. С. Проблема интерпретации в физической теории, у зб.: Логика и методология науки, М., 1967; Попович М. В. О философском анализе языка науки, Киев, 1966; Клини С. К. Введение в метаматематику, пер. с англ., М., 1957, ч. 1, гл. 3, § 15; Черч А. Введение в математическую логику, пер. с англ., т. 1, М., 1960.
У. М. Саўута. Мінск.

ІНТЭРФАЗА (інтэркінез), стадыя развіцця жывой клеткі паміж двума паступовымі мітатыч. дзяленнямі. Гл. ў арт. *Мітоз*.

ІНТЭРФЕРОМЕТР, аптычная вымяральная прылада, дзеянне якой заснавана на інтэрферэнцыі святла.

У І. выходны пучок святла раздзяляецца на два ці больш пучкоў, якія распаўсюджваюцца па розных шляхах. Потым гэтыя пучкі святла зноў сумяшчаюцца і інтэрферуюць. *Інтэрферэнцыя* дае магчымасць вызначыць адносіны рознасці ходу паміж асобнымі пучкамі да даўжыні хвалі святла, якое выкарыстоўваецца ў доследзе. Гэтыя адносіны — аснова для вылічэння розных іншых велічынь, што вызначаюцца з дапамогай І. Інтэрферометрычныя вымярэнні адрозніваюцца вял. адчувальнасцю і дакладнасцю. Розныя тыпы І. выкарыстоўваюцца пры вывучэнні невялікіх участкаў аптычных спектраў, для вымярэння паказчыка пераламлення газаў і змен паказчыкаў пераламлення цвёрдых целаў і вадкасцей, для дакладнага вымярэння даўжыні дэталяў і малых перамяшчэнняў, для праверкі аптычных дэталяў. І. Фабры-Перо, асн. элементам якога з'яўляюцца дзве плоскія, строга паралельныя адбівальныя паверхні, ужываецца як рэзанатар для *лазераў*.



Літ.: Ландсберг Г. С. Оптика, 4 изд., М, 1957; Борн М. и Вольф Э. Основы оптики, пер. с англ., М., 1970.
Б. А. Соўкі. Мінск.

ІНФАНТЫЛІЗМ, адсталасць фізічнага і псіхічнага развіцця арганізма або асобных яго органаў. Гл. *Полавых залоз хвароба*.

ІНФАРКТ МІЯКАРДА, хвароба з утварэннем ачага амярцвення — некрозу ў сардэчнай мышцы ад парушэння кровазвароту (спазмы або закупоркі сасудаў) у ёй. Найчасцей бывае пасля 50 гадоў у асоб з разумовым перанапружаннем і недастатковай фіз. актыўнасцю. Спрыяюць развіццю І. м. атэрасклероз, гіпертанічная хвароба, цукр. дыябет, атлусценне, стэнакардыя, курэнне, ужыванне алкаголю. Адна з найважн. сац.-мед. праблем сучаснасці.

І. м. апісалі айч. ўрачы У. М. Керніг (прыкметы, 1892), В. П. Абразцоў і М. Дз. Стражэска (класічную форму, 1909). Прыкметы І. м.: прыступ моцнага болю за грудзінай у вобласці сэрца з аддачай у руку, левую лапатку, шыю, вантробы, пот, рэзкі заняпад сіл, дыхавіца і парушэнне дзейнасці сэрца (ангінозны стан); можа быць моцны быль у жывоце (брушная форма). Т-ра 37,5—38,5 °С, трымаецца з 2-га да 7-га дня (востры перыяд). Ачуньвае хворы

паступова, за 1,5—2 месяцы (падвостры перыяд). Удакладняюць дыягназ электракардыяграфіяй. Ускладненні: калапс, анеўрызма сэрца, сардэчная недастатковасць. Лячэнне: пасцельны рэжым, шпіталізацыя, антыкаагулянты, болепатольныя сродкі (марфін, пантапон, прамедол, аміназін, закіс азоту); пры калапсе — мезатон, нарадрэналін, таламанал, гіпертэнзін, фібрыналізін з гепарынам; пры шоку — страфанцін, хлорыстыя калій, стэроідныя гармоны; пры парушэннях сардэчнага рытму — новакаінамід, хінідзін, індэрал, какарбаксілаза, сасударасшыральныя — хлорацызін, інтэнсаін. Дыэта з абмежаваннем тлушчаў, солі, вадкасці. Прафілактыка: дыспансерызацыя хворых на атэрасклероз, гіпертанічную хваробу, стэнакардыю, лячэбная фізкультура; не курыць і не ўжываць алкаголю.

Літ.: Довгялло Г. Х. Клиника и лечение инфаркта миокарда, «Здравоохранение Белоруссии», 1957, № 9; Лукомский П. Е. Инфаркт миокарда, у кн.: Многотомное руководство по внутренним болезням, т. 2, М., 1964; Гапелина И. Е., Бриккер В. Н. и Вольперт Е. И. Острый период инфаркта миокарда, Л., 1970.
В. М. Жайрыб. Мінск.

ІНФАРМАЦЫІ ТЭОРЫЯ, раздзел *кібернетыкі*, у якім вывучаюцца спосабы вымярэння, перадачы, ператварэння і захавання *інфармацыі*. У І. т. выкарыстоўваюцца метады *імавернасцей тэорыі, матэматычнай статыстыкі, алгебры, лікаў тэорыі, графаў тэорыі, гульняў тэорыі*. Інтэнсіўнае развіццё І. т. вызначаецца патрэбамі радыёсувязі, радыёлакацыі і інш. сродкаў сувязі, а таксама электроннай вылічальнай і кіравальнай тэхнікі. Пашыраюцца вобласці выкарыстання І. т. ў матэматыцы, фізіцы, генетыцы, псіхалогіі, лінгвістыцы. Заснавальнікам І. т. лічыцца амер. матэм. К. Шэнан (1948). Значны ўклад у абгрунтаванне І. т. зрабілі сав. вучоныя А. М. Калмагораў, А. Я. Хінчын, А. А. Харкевіч.

Асноўная частка І. т.— агульная тэорыя сувязі, якая распрацоўвае эфектыўныя метады перадачы інфармацыі па лініях сувязі (ЛС). Тут вывучаюцца праблемы аптымальнага *кадзіравання* і фільтрацыі інфармацыі, вылучэнне і прадказанне сігналаў. Даследуюцца таксама пытанні аналізу змястоўнасці і вызначэння каштоўнасці інфармацыі. У тэорыі сувязі вывучаюцца сігналы, якія паступаюць ад крыніцы ў выпадковай паслядоўнасці, але з вядомай імавернасцю. Спосаб вымярэння колькасці інфармацыі залежыць толькі ад імавернасці паяўлення паведамлення, а не ад яго фізічнай прыроды. За адзінку вымярэння (біт) бярэцца колькасць інфармацыі, што змяшчаецца ў сігнале з двума роўнаімавернаснымі магчымымі станамі. Калі крыніца можа выдаваць адно з $x_1, x_2, ..., x_n$ паведамленняў з імавернасцямі $p_1, p_2, ..., p_n$ адпаведна, то сігнал, які паступае ад яе, змяшчае

$$J = -\sum_{k=1}^{n} p_k \log_2 p_k$$

бітаў інфармацыі. Максімальная колькасць інфармацыі, якую можна перадаць па зададзенай ЛС у адзінку часу, наз. ля прапускной здольнасцю. Шэнан даказаў, што ў прынцыпе па ЛС можна перадаваць інфармацыю са скорасцю, якая набліжаецца да ля прапускной здольнасці, і з колькі пажадана малой хібнасцю. Спроба перавысіць гэту скорасць выклікае памылкі ў паведамленнях. Лепшыя ўмовы перадачы можна атрымаць ператварэннем (кадзіраваннем) сігналаў ад крыніцы ў новыя сігналы, найб. зручныя для ЛС. Напр., пры перадачы тэксту па тэлеграфе выкарыстоўваецца шырока вядомы код — азбука Морзе. Сігналы неабходна дэкадзіраваць пасля праходжання іх па ЛС. Пабудове і даследаванню розных метадаў кадзіравання і дэкадзіравання адпаведца вял. ўвага. Атрыманы многія класы кодаў, якія даюць магчымасць выявіць і выправіць памылкі пры перадачы інфармацыі па ЛС.

Літ.: Яглом И. М. Теория информации, М., 1961; Шеннон К. Работы по теории информации и кибернетике, пер. с англ., М., 1963; Бриллюен Л. Наука и теория информации, пер. с англ., М., 1960.
В. С. Айзенштат, М. А. Лепяшынскі. Мінск.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ АГЕНЦТВА ЗША (ЮСІА) (United States Information Agency, USIA), Цэнтральны ўрадавы інфармацыйна-прапагандысцкі орган ЗША. Засн. ў 1953. Штаб-кватэра ў Вашынгтоне. Дзейнічае ў цесным кантакце з дзярж. дэпартаментам, мін-вам абароны, Цэнтральным разведвальным упраўленнем. ЮСІА з'яўляецца галоўным сродкам ідэалагічных дыверсій амер. імперыялізму супраць Сав. Саюза і інш. сацыяліст. краін. Асн. накіраванасць дзейнасці агенцтва — антысавецкая і антыкамуніст. прапаганда, усхваленне т. зв. амер. спосабу жыцця, палітыкі і практыкі кіруючых колаў ЗША і іх паслядоўнікаў. Для дасягнення гэтай мэты шырока выкарыстоўваюцца *дэзінфармацыя*, падтасоўка фактаў, фальсіфікацыя і інш.

ЮСІА дзейнічае праз свае інфармацыйныя цэнтры (аддзяленні ЮСІА — ЮСІС), раскіданыя ў 101 краіне (крас. 1971). У распараджэнні агенцтва больш за 100 радыёперадатчыкаў (агульнай магутнасцю 15 млн. *ват*), праз якія на 40 мовах свету кожныя 850 гадзін на тыдзень вядзе перадачы служба радыёвяшчання ЮСІА *«Голас Амерыкі»*. Ідэалагічную апрацоўку грамадскай думкі ЮСІА ажыццяўляе праз свае «культурныя цэнтры», бібліятэкі, чытальні. Агенцтва арганізоўвае выпуск і пракат мноства кальровых дыяпазітываў, кінаі тэлевізійных фільмаў, стварае выстаўкі і фотавітрыны, арганізоўвае курсы па вывучэнні англ. мовы. ЮСІА і яго замежныя аддз. выпускаюць і распаўсюджваюць (звычайна бясплатна) больш як 80 часопісаў, 60 газет і «насценных інфармацый», дзесяткі млн. экз. кніг, брашур, у т. л. «кішэнькарцінкі», разлічаныя на непісьменных. Акрамя таго, ЮСІА залучае ў кола сваёй дзейнасці замежныя органы масавай інфармацыі, для гэтага ў распараджэнні агенцтва ёсць спецыяльны (неафіцыйны) фінансавы фонд, які субсідзіруюць буйныя амер. манаполіі (афіцыйна бюджэт ЮСІА дасягае 200 млн. долараў). Толькі ў краінах Лац. Амерыкі за кошт гэтага фонду выдаецца 400 газет і 200 часопісаў. Да сеткі ЮСІА далучаюцца і 154 т. зв. двухнацыянальныя цэнтры ў замежных краінах, якія працуюць пад яго ўплывам. Ідэалагічныя дыверсіі ЮСІА звычайна не дасягаюць мэты. Прагрэс. сілам свету вразумелы антынародны, антыкамуністычны змест імперыял. прапаганды.

Літ.: Хачатуров К. А. Идеологическая диверсия под видом информации, М., 1970.
М. Ф. Дубянецкі. Мінск.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ БЮРО КАМУНІСТЫЧНЫХ І РАБОЧЫХ ПАРТЫЙ, міжнар. цэнтр шэрагу камуніст. і рабочых партый, які існаваў у 1947—56; складаўся з прадстаўнікоў цэнтр. камітэтаў партый, што ўваходзілі ў яго: Балг. камуніст. партыі, Венг. партыі працоўных, Італьян. камуніст. партыі, Польскай аб'яднанай рабочай партыі, Рум. рабочай партыі, КПСС, Франц. камуніст. партыі, Камуніст. партыі Чэхаславакіі, Камуніст. партыі Югаславіі (да 1948). Мэта Інфармбюро — арганізоўваць абмен вопытам паміж кампартыямі, каардынаваць іх дзейнасць, згуртоўваць рабочы клас і ўсіх працоўных на барацьбу за мір, дэмакратыю і сацыялізм. Інфармбюро знаходзілася ў Бялградзе (1947—48), у Бухарэсце (1948—56). Друкаваны орган — газ. «За прочный мир, за народную демократию». У крас. 1956 паводле сумеснага рашэння ЦК партый, што ўваходзілі ў Ін-

фармбюро, яго дзейнасць і выданне газеты спынены, бо ў новых умовах былі патрэбны новыя формы сувязей паміж кампартыямі.

ІНФАРМАЦЫЯ ў кібернетыцы (ад лац. informatio тлумачэнне, выкладанне), цэнтральнае паняцце *кібернетыкі* для вызначэння мэтазгодна ўпарадкаванай структуры аб'ектаў і ўздзеянняў. Адрозніваюць два асн. тыпы І.— звязаную і свабодную. Звязаная І.— упарадкаваная прасторавая структура кібернетычных сістэм (жывой клеткі, мозгу, машыны і г. д.), іх арганізацыя. Свабодная І.— упарадкаваная ў часе структура ўздзеянняў, якою карыстаюцца для кіравання. Матэрыяльны посьбіт свабоднай І.— сігнал. У дастасаванні да тэхнікі свабодная І.— гэта парадак руху атамарных сігналаў рознай фіз. прыроды (імпульсаў току, адтулін на перфастужцы і інш.).

Каб вызначыць колькасць звязанай І., выкарыстоўваюць некат. неімавернасныя метады; пры свабоднай І. ўжываецца *імавернасцей тэорыя*, матэм. апарат якой для найбольш простых выпадкаў перадачы І. ў тэхніцы выкарыстаў амер. вучоны К. Шэнан. Напр., калі вядома частата няроўнаімаверных вынікаў, вызначаюць колькасць І., разглядаючы яе як знятую выбарам неазначальнасць. Адзін біт І. дапускае выбар адной з дзвюх роўнаімаверных альтэрнатыў і з'яўляецца адзінкай вымярэння І. Пры ўзаемадзеянні атрыманай звонку свабоднай І. з уласнай звязанай І., памяццю кібернетычнай сістэмы, у апошняй развіваюцца інфармацыйныя працэсы (актуальная І. як момант функцыянальнага адлюстравання), падобныя, але не тоесныя свядомасці як унутранаму стану чалавечага мозгу. На Зямлі першыя кібернетычныя сістэмы ўзніклі разам з жыццём, таму І. па-за дзейнасцю кібернетычных сістэм няма. У нежывой прыродзе існуе толькі магчымасць, перадумова І. (так званая «патэнцыяльная» І.) у выглядзе структуры аб'ектаў і ўздзеянняў, уласцівасцей і адносін. І.— не субстратная ўласцівасць любога аб'екта, а функцыянальная ўласцівасць і сувязь сістэм арганізаванай прыроды, г. зн. жывой прыроды, грамадства, тэхнікі. Акрамя актуальнай І. як працэсу і выніку ўзаемадзеяння звязанай і атрыманай звонку свабоднай І., з узнікненнем грамадства пачала стварацца «мёртвая» І., якую ўтвараюць звязаная І. нядзейнага тэхн. прыстасавання і не закладзеная ў дадзены момант свабодная І., змешчаная ў кнігах, перфакартах, стужках мікрафільма і інш. І. класіфікуецца таксама па відах, якія адпавядаюць асн. структурным узроўням прыроды і формам руху матэрыі: біялагічная, тэхнічная і сацыяльная І. Апошняя падзяляецца на І. эканамічную, палітычную, ваенную, навук.-тэхнічную і інш. Своечасовы збор, апрацоўка, захаванне і выкарыстанне І. ў грамадстве разглядаецца як адзін з найважнейшых кірункаў паскарэння прагрэсу чалавецтва. Гл. таксама *Інфармацыі тэорыя*.

Літ.: Вентцель Е. С. Теория вероятностей, 4 изд., М., 1969; Жуков Н. И. Информация, Мн., 1966; Урсул А. Д. Природа информации, М., 1968; Бриллюэн Л. Научная неопределенность и информация, пер. с англ., М., 1966.

М. І. Жукаў. Мінск.

ІНФЕКЦЫЙНЫЯ ХВАРОБЫ (заразныя хваробы), хваробы людзей, жывёл і раслін, якія выклікаюцца хваробнымі бактэрыямі, вірусамі, рыкетсіямі, прасцейшымі. Пры пэўных умовах выклікаюць *эпідэміі*.

Пашырэнне І. х. залежыць ад складанага ўзаемадзеяння біял. і сац. фактараў. Гал. роля ў гэтым працэсе належыць сац., эканам. і культурна-бытавым умовам жыцця. І. х.— адна з асн. прычын смяротнасці, страты працаздольнасці і памяншэння працягласці жыцця. Ліквідацыя І. х.— найважн. сац.-мед. праблема сучаснасці. І. х. падзяляюць на 4 групы: кішачныя *(брушны тыф, халера, дызентэрыя)*; інфекцыі дыхальных шляхоў *(грып, адзёр, дыфтэрыя, туберкулёз)*; «крывяныя» інфекцыі *(малярыя, сыпны тыф, зваротны тыф, чума)*; інфекцыі скуры *(короста, парша, трахома)*. На Беларусі былі пашыраны эпідэміі халеры (1831, 1848, 1853, 1866, 1871, 1893, 1910, 1915), сыпнога тыфу (1812, 1827, 1831, 1835, 1845, 1850, 1853, 1856, 1870, 1881, 1893, 1908, 1915, 1923), брушнога тыфу, дызентэрыі, воспы натуральнай, дыфтэрыі, венерычных хвароб, а спрод сельскага насельніцтва — малярыя, трахома, туберкулёз. Да 1941 ліквідаваны халера, зваротны тыф, воспа натуральная, мяккі шанкер, пахвінны лімфагранулематоз. У гады ням.-фаш. акупацыі на тэр. Беларусі былі пашыраны эпідэміі паразітарных тыфаў і малярыі, тулярэмія, лептаспіроз, туберкулёз, трахома, сіфіліс і інш. Пасля Вял. Айч. вайны ліквідаваны малярыя, трахома, сыпны тыф, поліяміэліт. Дыфтэрыя, сіфіліс, востры гепарэн бываюць у адзінкавых выпадках.

Літ.: Белоцкий Д. П. Развитие санитарного дела в Белорусской ССР, Мн., 1966.

Дз. П. Бяляцкі. Мінск.

ІНФЕКЦЫЯ (лац. inficio заражаю), пранікненне ў арганізм чалавека або жывёлы ўзбуджальнікаў хваробы (мікробаў, вірусаў, прасцейшых і інш.) з наступным іх размнажэннем і хваробатворным дзеяннем. Крыніца заражэння — хворыя і здаровыя (бацыланосьбіты) людзі, жывёлы, напр. сабакі (шаленства), грызуны (чума, тулярэмія). Інфікаванне адбываецца пры непасрэдным кантакце (венерычныя хваробы), праз рот з харч. прадуктамі і вадою (брушны тыф, дызентэрыя), праз дыхальныя шляхі (грып, адзёр, шкарлятына, туберкулёз), насякомымі (малярыя, сыпны тыф). Гл. таксама *Інфекцыйныя хваробы*.

Літ.: Давыдовский И. В. Учение об инфекции, М., 1956; Здродовский П. Ф. Проблемы инфекции, иммунитета и аллергии, 3 изд., М., 1969.

ІНФЕЛЬД (Infeld) Леапольд (20.8.1898, Кракаў — 16.1.1968), польскі фізік. Чл. Польскай АН (1952) і АН інш. краін. Скончыў Ягелонскі ун-т у Кракаве (1921). Працаваў у Львоўскім (1930—33), Кембрыджскім (Вялікабрытанія, 1934—35), Прынстанскім (ЗША, 1936—38) і Таронцкім (Канада, 1939—50) ун-тах. Супрацоўнічаў з А. Эйнштэйнам. Вярнуўшыся ў Польшчу (1950), вёў пед. і н.-д. работу ў Варшаўскім ун-це і Польскай АН. Асн. навук. працы па агульнай тэорыі адноснасці, нелінейнай электрадынаміцы, квантавай механіцы. Аўтар публіцыстычных твораў, маст. біяграфій вучоных. Актыўны ўдзельнік работы Усяпольскага к-та міру і Сусв. Савета Міру.

Тв.: Albert Einstein. Jego dzieło i rola w nauce, Warszawa, 1956; Szkice z przeszłości, Warszawa, 1966; рус. пер.— (разам з Е. Плебаньскім) Движение и релятивизм, М., 1962; Эварист Галуа. Избранник богов, М., 1965; (разам з А. Эйнштэйнам) Эволюция физики, 4 изд., М., 1966.

ІНФІЛЬТРАЦЫЯ ў геалогіі (франц. infiltration), прасочванне паверхневых водаў у тоўшчу зямной кары праз капілярныя і субкапілярныя поры, шчыліны і інш. пустоты ў горных пародах.

ІНФІЛЬТРАЦЫЯ (у медыцыне), пранікненне і назапашванне ў тканках клетачных элементаў, біял. вадкасцей (крыві, лімфы) і хім. рэчываў. Адрозніваюць фізіял. (утварэнне вілачнай залозы, лімфатычных вузлоў) і паталаг. (запаленне, пухліны). Тэрмінам І. абазначаюць насычэнне тканак растворамі для мясцовага абязбольвання.

ІНФІНІТЫЎ (лац. infinitivus няпэўны), неазначальная форма, начатковая дзеяслоўная форма, якая называе дзеянне безадносна да асобы, часу і спосабу. Паводле паходжання ў слав. мовах — давальны склон аддзеяслоўных назоўнікаў. Мае трыванне і стан («рабіць — зрабіць — зрабіцца»). У бел. мове І. складаецца з дзеяслоўнай асновы і суфіксаў «-ць», «-ці», «-чы» («чытаць», «несці», «секчы»). У сказе выступае самастойна (як дзейнік, просты выказнік ці асн. ч. састаўнога выказніка, дапаўненне, азначэнне, акалічнасць) і ў складзе аналітычных формаў часу дзеяслова («буду ісці»).

Літ.: Гл. пры арт. *Дзеяслоў*.

ІНФЛЯЦЫЯ (лац. inflatio разбуханне), характэрнае капіталіст. краінам абясцэненне *папяровых грошай*, калі іх выпуск перавышае патрэбы абароту і грошы траціць цану ў адносінах да золата і тавараў. І.— вынік парушэння закону *грашовага абарачэння*, характарызуецца ростам таварных цэн і падзеннем рэальнай заработнай платы рабочых. Вядзе да пераразмеркавання нац. даходу на карысць буржуазіі.

У перыяд вайны і мілітарызацыі эканомікі капіталіст. краіны выкарыстоўваюць інфляцыйны выпуск папяровых грошай, каб пакрыць дэфіцыт бюджэту. Дадаткова выпушчаныя папяровыя грошы ідуць на гонку ўзбраенняў, ваенныя авантуры, падтрымку рэакцыйных рэжымаў. Толькі ў 1970 краіны — удзельніцы НАТО затрацілі на ваен. мэты 103 млрд. долараў. Вынік — дэфіцытнасць бюджэту і плацежнага балансу капіталіст. краін, рост цэн на тавары і паслугі, востры крызіс валютна-фін. сістэмы. З'явы І. могуць быць і пры нізменнай колькасці папяровых грошай, калі становіцца менш тавараў у абарачэнні. Абясцэньванню грошай у перыяд І. спрыяе дэфіцытнасць плацежнага балансу і адліў золата з краіны. У перыяд агульнага крызісу капіталізму І. стала ўсеагульнай і хранічнай. У 2-ю сусв. вайну (1939—45) яна ахапіла большасць краін свету і не спынялася пасля вайны, а ў некат. краінах (Францыя, Італія, Японія, Грэцыя) выпуск грошай нават перавысіў іх выпуск у ваенны час. Бурж. эканамісты сцвярджаюць, што вінаваты ў гэтым рабочы клас, які барацьбой за павышэнне заработнай платы нібыта выклікае ўзмацненне І. Беспадстаўнасць такіх сцвярджэнняў відаць з таго, што прыбыткі капіталіст. манаполій у перыяд І. растуць большымі тэмпамі, чым намінальная заработная плата рабочых. У СССР з'ява І. была ў першыя гады Сав. улады (1917—24) і ў Айч. вайну (1941—45). Мела часовы характар, была выклікана неабходнасцю мабілізаваць матэр. каштоўнасці на барацьбу з ворагам.

Літ.: Маркс К. Капітал, т. 1, Мн., 1952, разд. 3; Энгельс Ф. Да крытыкі палітычнай эканоміі, Мн., 1952, разд. 2; Ленін У. І. Пагражаючая катастрофа і як з ёю змагацца, Тв., т. 25 (Поли. собр. соч., т. 34); Атлас З. В. Социалистическая денежная система, М., 1969; Стадниченко А. И. Валютные потрясения на Западе, М., 1968; Аникин А. В. Валютные проблемы Западной Европы, М., 1960.

М. А. Панін. Мінск.

ІНФРАГУК (ад лац. infra ніжэй, пад), пругкія ваганні нізкай частаты (менш за 20 *гц*) у паветры і ў інш. асяроддзі, што не ўспрымаюцца чалавечым вухам. Моцны І. выклікае ў слыхавым апараце адчуванне ціску і нават боль. І. мала паглынаецца асяроддзем. Прыклады І.— ваганні паверхні мора (т. зв. «голас мора»), сейсмічныя хвалі ў зямной кары і інш. Штучныя І. ад выбуху зарадаў выкарыст. пры пошуках карысных выкапняў.

ІНФРАЧЫРВОНАЯ ТЭХНІКА, сукупнасць прылад і тэхнічных канструкцый, дзеянне якіх заснавана на выкарыстанні *інфрачырвоных прамянёў*. Шырока ўжываецца ў ваен. справе.

Напр., цеплапеленгатары ўлоўліваюць інфрачырв. прамяні, што вылучаюцца нагрэтымі часткамі карабля ці самалёта, і гэтым паказваюць кірунак на іх. Электронна-аптычныя пераўтваральнікі (ЭАП) забяспечваюць бачнасць у цемнаце прадметаў, асветленых інфрачырвонымі прамянямі. Візіры з ЭАП даюць магчымасць кіраваць ноччу аўтамашынамі, танкамі, весці прыцэльную стральбу; ужываюцца ў навігацыі. Дэталі элемнога ландшафту па-рознаму награюцца за дзень, ноччу яны выпраменьваюць неаднолькавую колькасць інфрачырв. прамянёў. На гэтым засн. складанне цеплавых картаў элмной паверхні, ваенная і метэаралаг. разведка. Прылады І. т. па касм. караблях і спадарожніках памагаюць арыентаваць касм. апараты ў прасторы. І. т. выкарыстоўваецца таксама для сушкі розных вырабаў і буд. канструкцый, аховы памяшканняў, у медыцыне для праграванння і дыягностыкі. У прамысловасці ўжываюцца малагабарытныя інфрачырв. аналізатары (датчыкі), засн. на выкарыстанні *дысперсійных фільтраў*.

Літ.: Иванов Ю. А. и Тяпкин В. В. Инфракрасная техника в военном деле, М., 1963; Лазарев Л. П. Инфракрасные и световые приборы самонаведения и наведения летательных аппаратов, 2 изд., М., 1970; Вафиади В. Г. Фотоэлектрическая автоматика, Мн., 1966; Дерибере М. Практические применения инфракрасных лучей, пер. с франц., М.— Л., 1959.

У. Г. Вафіядзі. Мінск.

ІНФРАЧЫРВОНЫЯ ПРАМЯНІ, нябачнае чалавечым вокам электрамагнітнае выпрамяненне з даўжынёй хваляў ад $0{,}76 \cdot 10^{-6}$ *см* да 0,05—0,1 *см*, г. зн. ад чырвонага канца бачнага спектра да найб. кароткіх радыёхваляў.

І. п. адкрыты ў 1800 У. Гершэлем, які заўважыў, што ртутны тэрмометр паказвае павышаную т-ру нават пры перамяшчэнні яго за чырвоны канец сонечнага спектра (лац. infra за). І. п. вылучае ўсякае нагрэтае цела. Пры павышэнні т-ры магутнасць выпрамянення расце. Для выяўлення і вымярэння патокаў І. п. ужываюць *балометры*, тэрмаэлементы, оптыка-акустычныя і фотаэлектрычныя прыёмнікі, пераважна фотасупрацьўленні. Вылучыць І. п. з агульнага патоку выпрамянення можна з дапамогай прызмы, *дыфракцыйнай рашоткі*, святлофільтраў і інш.

І. п. карыстаюцца для спектральнага аналізу хім. злучэнняў, пры вывучэнні структуры складаных малекул, некантактавым вымярэнні т-ры і дэфектаскапіі вырабаў. Шырока ўжываюцца ў ваен. справе (гл. *Інфрачырвоная тэхніка*). У Ін-це фізікі АН БССР і ў БДУ распрацоўваюцца спектраскапічныя метады аналізу розных рэчываў, засн. на выкарыстанні інфрачырв. прамянёў.

Літ.: Левитская М. А. Инфракрасные лучи, М.— Л., 1935; Физика и техника инфракрасного излучения, пер. с англ., М., 1965.

У. Г. Вафіядзі. Мінск.

ІНФУЗОРЫІ (Infusoria), клас прасцейшых жывёл. Каля 6000 відаў, пашыраных ва ўсім свеце.

Даўж. ад 20 *мкм* да 3 *мм*. У спец. паглыбленні размешчаны рот, праз які ежа (бактэрыі і інш. прасцейшыя) пападае ў глотку, а яе — у стрававальную вакуолю.



Інфузорыя туфелька (Paramecium caudatum): *1* — раснічкі; *2* — стрававальныя вакуолі; *3* — макрануклеус; *4* — мікрануклеус; *5* — ротавая адтуліна і глотка; *6* — скарачальная вакуоля.

Неператраўленыя рэшткі выкідваюцца праз спец. адтуліну. Некат. І. жывяцца асматычным спосабам (гл. *Осмас*). Большасць маюць скарачальныя вакуолі, праз іх выдаляюць з арганізма лішкі вады і прадукты метабалізму. У вонкавым слаі пратаплазмы шмат якіх І. ёсць жыгучыя палачкі — органы абароны і нападу. 2 тыпы ядраў: макрануклеусы (рэгулююць абмен рэчываў) і мікрануклеусы (удзельнічаюць у палавым размнажэнні — кан'югацыі, калі 2 асобіны абменьваюцца часцінкамі мікрануклеуса). Ёсць бясполае размнажэнне — жывёла дзеліцца ўпоперак на 2 часткі. Жывуць І. ў прэсных і марскіх вадаёмах, некаторыя ў вільготнай глебе. Перамяшчаюцца з дапамогай расічак. У неспрыяльных умовах зацягваюцца шчыльнай абалонкай — цыстай. Многія І. (балантыдый, іхтыяфтырыус, хіладон, трыхадзіна і інш.) — паразіты. Выклікаюць хваробы жывёл і чалавека.

Літ.: Жизнь животных, т. 1, М., 1968.

У. П. Ляхновіч. Мінск.

ІНШАРОДНЫЯ ЦЕЛЫ, чужародныя арганізму прадметы, якія трапляюць пад скуру, у мышцы, стрававальна-кішачны тракт, у органы дыхання, слыху, зроку і мачаполавую сістэму. Да І. ц. адносяць таксама камяні (канкрэменты), якія ўтвараюцца ў арганізме ад парушэння абмену рэчываў (гл. *Жоўцекамянёвая хвароба, Ныркавакамянёвая хвароба*).

У дыхальных шляхах выклікаюць прыступы кашлю, дыхавіцу, хваробы лёгкіх; у стрававальна-кішачным тракце выходзяць без шкоды або затрымліваюцца і выклікаюць запаленне слізістай абалонкі, прарыў сценкі і перытаніт; у воку — боль, слёзацячэнне, парушэнне зроку (гл. *Вачэй хваробы*) і інш. Лячэнне: выдаляюць І. ц. кансерватыўнымі і хірург. спосабамі.

Літ.: Архангельский В. Н. Глазные болезни, 2 изд., М., 1969; Афанасьева Н. Г. Инородные тела в дыхательных путях и пищеводе, «Здравоохранение Белоруссии», 1964, № 10.

ІОГА (санскр. злучэнне, канцэнтраванне), ідэалістычная сістэма старажытнаіндыйскай філасофіі, у адпаведнасці з якой чалавек шляхам самапазнання можа вызваліць сваю свядомасць (душу) з-пад уплыву ўмоў матэрыяльнага існавання і зліць яе з абсалютам (богам).

Адзін з раздзелаў — Раджа-І.— уключае патрабаванні фіз. практыкаванняў, ажыццяўлення кантролю за дыханнем, нармаванага харчавання, правядзення прафілакт. мерапрыемстваў і выканання прынятых правілаў паводзін у жыцці. Пад вучэннем іогаў часцей за ўсё разумеюць гатыя патрабаванні, абагачаныя рацыяналынымі нар. назіраннямі. Яны даюць магчымасць з дапамогай пэўных фіз. прыёмаў і самаўнушэння рабіць станоўчы ўплыў на псіхіку чалавека і фізіял. работу арганізма. Сучасная бурж. ідэаліст. філасофія выкарыстоўвае І., каб абгрунтаваць розныя містычныя сістэмы.

Літ.: Радхакришнан С. Индийская философия, пер. с англ., т. 2, М., 1957, с. 296—330; Бродов В. В. Индийская философия нового времени, М., 1967.

ІОЖЭФ (József) Атыла (11.4.1905, Будапешт — 3.12.1937), венгерскі паэт, прадстаўнік сацыяліст. рэалізму ў венг. л-ры. Чл. Камуніст. партыі Венгрыі з 1930. З сям'і рабочага. Слухаў лекцыі ў ун-тах Сегеда, Будапешта, Вены і Парыжа, але беднасць не дала магчымасці закончыць адукацыю. Першы зб. «Папрашайка прыгажосці» (1922). Ранняя паэзія, не пазбаўленая ўплыву мадэрнізму, выявіла глыбокае адчуванне паэтам класавай несправядлівасці і сац. прыгнёту (зб. «Не я крычу», 1924; «Ні бацькі, ні маці», 1929). Паэт. майстэрства, асэнсаванне сац. супярэчнасцей жыцця з пазіцый філасофіі марксізма, антыфаш. перакананні, пратэст супраць капіталіст. эксплуатацыі, вера ў перамогу пралет. рэвалюцыі дасягнулі вяршыні ў зб. «Пні карчуй і не скуголь» (1931), «Ноч ускраіны» (1932), «Мядзведжы танец» (1934). У апошнім зб. «Вельмі балюча» (1936) рашучы пратэст супраць фаш. рэакц. рэжыму Хорці спалучаецца з матывамі песімізму і адчаю. Перакладаў вершы У. Маякоўскага, С. Ясеніна, А. Блока. Прэмія імя Кошута (1948, пасмяротна).

Тв.: Рус. пер.— Стихи, М., 1962.

ІОКАІ (Jókai) Мор (18.2.1825, г. Комарам — 5.5.1904), венгерскі пісьменнік, прадстаўнік рамантызму ў венгерскай л-ры. Удзельнік бурж. рэв. 1848—49, пасля яе паражэння перайшоў на пазіцыі лібералізму. Першы раман «Будні» (1846). Кн. «Рэвалюцыйныя баталіі 1848—1849 гадоў» (1850), раман «Сыны чалавека з каменным сэрцам» (1869) пра рэвалюц. падзеі 1848—49. У гістар. раманах «Залаты век Трансільваніі» (1852), «Туркі ў Венгрыі» (1853) паказаў нац.-вызв. рух. Ліберальныя ілюзіі, вера ў бурж. «прагрэс» далі пра сябе знаць у раманах «Венгерскі набоб» (1853), «Золтан Карпаці» (1854), «Новы землеўладальнік» (1863). У найлепшых раманах «Чорныя дыяменты» (1870), «Залаты чалавек» (1873) і інш. набліжаўся да рэаліст. абагульнення.

Тв.: Рус. пер.— Сыновья человека с каменным сердцем, М., 1959; Золотой человек, М., 1965.

ІОНАЎ Анатоль Дзмітрыевіч [н. 28.7(10.8). 1917, с. Андрэеўскае Валакаламскага пав. Маскоўскай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1939. У Чырв. Арміі з 1940. Лётчык. Зрабіў 107 баявых вылетаў. У час вызвалення Беларусі знішчыў 12 танкаў, 68 аўтамашын, 30 гармат і шмат інш. варожай тэхнікі. Жыве ў Маскве.

ІОННАЯ СУВЯЗЬ, гл. ў арт. *Хімічная сувязь.*

ІОННЫ АБМЕН, абмен *іонаў* паміж двума электралітамі. Звычайна пад І. а. разумеюць абмен іонаў паміж растворамі і цвёрдымі электралітамі *(іанітамі).*

І. а. адбываецца ў эквівалентных адносінах і ваўсёды абарачальны. Характэрнае ўласцівасць — выбіральнасць (селектыўнасць), г. зн. здольнасць да пераважнага паглынання аднаго віду іонаў з іх сумесі. І. а. можна разглядаць як абменную хім. рэакцыю тыпу

$$RNa + \frac{1}{2}Ca^{2+} \rightleftarrows \frac{1}{2}RCa + Na^{+},$$

дзе R паказвае, што рэчыва знаходзіцца ў фазе іаніту. Канцэнтрацыйная канстанта такой рэакцыі — мера селектыўнасці (гл. *Раўнавага хімічная*). Працэс І. а. мае дыфузны характар. Каэфіцыент дыфузіі іонаў у іанітах мае парадак 10^{-6} *см²/сек* і памяншаецца з павелічэннем зарада іонаў і ступені сшытасці іанітаў.

Літ.: Термодинамика ионного обмена. Сб., М., 1968; Гельферих Ф. Иониты. Основы ионного обмена, пер. с нем., М., 1962.

У. С. Салдатаў. Мінск.

ІОНЫ (грэч. iōn які ідзе), зараджаныя часцінкі: атамы ці групы хімічна звязаных атамаў з лішкам або недахопам электронаў. Дадатна зараджаныя І. наз. катыёнамі, адмоўна зараджаныя — аніёнамі.

Абазначаюцца І. сімваламі хім. элементаў са знакам плюс (катыёны) ці мінус (аніёны) і лічбай, якая паказвае, колькі электронаў лішніх ці колькі не хапае, напр., адназарадны катыён вадароду H^+, двухзарадны аніён сернай к-ты SO_4^{2-}. Утвараюцца пры адрыве (далучэнні) ад атамаў або малекул электронаў, пратонаў ці іонаў (гл. *Іанізацыя*). І.— хімічна актыўныя часцінкі, адыгрываюць важную ролю ў многіх фіз. і хім. працэсах. Гл. таксама *Электрычныя разрады ў газах, Электралітычная дысацыяцыя, Крышталі, Іанасфера.*

Літ.: Гл. пры арт. *Іанізацыя.*

ІОРДАНС (Jordaens) Якаб (19.5.1593, Антверпен — 18.10.1678), фламандскі жывапісец і рысавальшчык. Працаваў у Антверпене. Сярод твораў: «Пакланенне пастухоў», 1618; «Сатыр у селяніна», каля 1618; «Алегорыя Урадлівасці», каля 1625—28; «Бабовы кароль», 1638; і інш. Перадача рэліг. і міфалаг. сюжэтаў у жанравым плане, адценне грубаватай пачуццёвасці, зварот да традыцыйных народных святаў, шырокая жывапісная манера — своеасаблівыя рысы творчасці І.

Літ.: Шмидт Д. А. Рубенс и Иорданс, Л., 1926; Смольская Н. (сост.). Якоб Иорданс, М., 1959.

ІОЎКАЎ Іардан (9.11.1880, в. Жараўна Слівенскай акр.— 15.10.1937), балгарскі пісьменнік. Вучыўся на юрыста, настаўнічаў, быў прэс-аташэ ў Бухарэсце. З 1927 працаваў у мін-ве замежных спраў. Друкавацца пачаў у 1905. Вядомасць прынеслі «Апавяданні» (т. 1—2, 1917—1918). Як майстар рэаліст. навелы, тонкі псіхолаг выступіў у зб. «Апошняя радасць» (1926), «Старапланінскія легенды» (1927), «Вечары ў Анцімаўскім заезным доме» (1928), «Жаночае сэрца» (1935); «Калі б яны маглі гаварыць» (1936), дзе суровасць «вясковага» рэалізму спалучаецца з рамантычнай фалькл. прыўзнятасцю. Паслабленне сац. крытыкі адчуваецца ў драмах «Албена» (1930), «Бара́на» (1932), «Звычайны чалавек» (1936), у камедыі «Мільянер» (1930), аповесці «Жнец» (1920), у раманах «Хутар каля граніцы» (1934) і «Прыгоды Гараломава» (незакончаны, 1938).

Тв.: Събрани съчинения, т. 1—7, София, 1956; бел. пер.— у кн.: Скарб, Мн., 1967; рус. пер.— Рассказы, М., 1957.

Н. С. Гілевіч. Мінск.

ІОФЕ Абрам Фёдаравіч [17(29).10.1880, г. Рамны Палтаўскай губ.— 14.10.1960], савецкі фізік. Акад. АН СССР (1920, чл.-кар. 1918). Герой Сац. Працы (1955).



Чл. КПСС з 1942. Скончыў Пецярбургскі тэхнал. ін-т (1902). У 1921—50 дырэктар Фізіка-тэхн. ін-та, у 1954—60 — Ін-та паўправаднікоў АН СССР. Навук. працы па вывучэнні фіз. уласцівасцей дыэлектрыкаў і паўправаднікоў, распрацоўцы тэорыі тэрмаэлектрычных генератараў, па фізіцы крышталяў, эксперым. абгрунтаванні квантавай тэорыі святла і механізма фотаэфекту. Чл. 8 замежных акадэмій, ганаровы д-р 5 ун-таў, ганаровы чл. 3 фіз. т-ваў. Дзярж. прэмія СССР 1942, Ленінская прэмія 1961. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, медалямі.

Тв.: Основные представления современной физики, Л.— М., 1949; Физика полупроводников, М.— Л., 1957; Полупроводниковые термоэлементы, М.— Л., 1960.

Літ.: Сominский М. С. Абрам Федорович Иоффе, М.— Л., 1964; Абрам Федорович Иоффе, М., 1960 (Материалы к биобиблиогр. ученых СССР).

ІПА, рака, левы прыток Прыпяці (бас. Дняпра). Даўж. 119 *км.* Значная частка І. каналізавана. Цячэ ў Светлагорскім, Калінкавіцкім і Мазырскім р-нах Гомельскай вобл. Вадазбор (1010 *км²*) — слабахвалістая, параэаная асушальнымі канавамі, аблесеная раўніна. Пад балотамі 29%, пад лесам 33, разарана 30% тэр. Шыр. даліны 1,5—2 *км.* Найб. прыток р. Віша (справа). Ледастаў з сярэдзіны снеж. да канца крас. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады каля в. Рудня Еўтушкоўская 2,24 *м³/сек*, у вусці каля 5,8 *м³/сек.* І.— водапрыёмнік пры асушэнні балотаў.

Н. Дз. Шэка. Мінск.

ІПАДРОМ (грэч. hippódromos ад hippós конь+drómos месца для бегу), спартыўнае збудаванне для коннаспартыўных спаборніцтваў, выпрабавання, трэнінгу і выставак племянных коней.



Камбінаваны скакавы іпадром: *1* — вонкавая дарожка для скачак і рэзвых галопаў (травяная); *2, 3* — для работы кентэрам (араныя); *4* — для работы рыссю (араная); *5* — вольтавыя кружкі для крокавай работы; *6* — судзейская; *7* — трыбуны гледачоў.

Бываюць І. для выпрабаванняў верхавых, рысістых і ламавых племянных коней і камбінаваныя (гл. рыс.). На тэрыторыі І. размяшчаюцца стайні, вет. лазарэт, кузня і інш. гасп. пабудовы. Каля трыбун гледачоў ёсць месца для сядлоўкі і вываджкі коней перад скачкамі (т. зв. падок).

ІПАЛІТ (Старац; г. н. і см. невяд.), беларускі і рускі разьбяр па дрэве 17 ст. Манах з Оршы. Працаваў у Палаце разьбярных і сталярскіх спраў Маск. Крамля. З вучнямі Яфімам Анціп'евым, Данілам Грыгор'евым і Ларкам Юр'евым рэзаў і залаціў стаўпы і гербы царскіх карэт, іканастасы, ракі для мошчаў, рызніцы, шафы, куфры і інш. У 1679 стварыў рэльефнае распяцце для Галгофы ў царкве Уваскрасення Славушчага і рысункі кафляных упрыгожанняў купалоў Верхняспаскага сабора ў Маск. Крамлі.

Г. І. Барышаў. Мінск.

ІПАЛІТАЎ-ІВАНАЎ (сапр. Іванаў) Міхаіл Міхайлавіч [7(19).11.1859, Гатчына — 28.1. 1935], рускі савецкі кампазітар, дырыжор і муз. дзеяч. Нар. арт. Рэспублікі (1922). Скончыў Пецярбургскую кансерваторыю (1882, клас М. Рымскага-Корсакава). Кіраваў у Тыфлісе арганізаваным ім аддзяленнем Рус. муз.

т-ва і муз. вучылішчам. З 1893 праф. Маск. кансерваторыі (у 1906—22 рэктар). Пед. работу сумяшчаў з дырыжорскай (з 1925 у Вял. т-ры СССР). Актыўны ўдзельнік станаўлення сав. муз. культуры, нёс у яе пераемнасць традыцый рус. класічнай музыкі. З твораў: оперы «Руф» (паст. 1887), «Азра» (паст. 1890), «Ася» (паст. 1900), «Здрада» (паст. 1910), кантата «Гімн працы» (1934), сімфанічныя сюіты «Каўказскія эскізы» (1894), «Цюркскія фрагменты» (каля 1930), сімфанічныя паэмы «Мцыры» (1924) і «1917 год», «Юбілейны марш» (1931), рамансы. У 1923—24 узначальваў *Беларускую песенную камісію*, яго апрацоўкі бел. нар. песень апублікаваны ў зборніку «Беларускія народныя песні. Сольныя і харавыя з акампанементам фп.» (Мн., 1928). Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Літ. тв.: 50 лет русской музыки в моих воспоминаниях, М., 1934.

ІПАМЕЯ (Ipomoea), род травяністых і кустовых раслін сям. бярозкавых. Вядома каля 400 відаў, пашыраных у тропіках.

Найб. каштоўны батат — салодкая бульба (I. batatas). У СССР культывуецца з 1933 (у Сярэдняй Азіі, на Каўказе, Пд Украіны). Ва ўмераным клімаце аднагадовая расліна. Клубні ядомыя, бацвінне ідзе на корм жывёле. На Беларусі вырошчваецца I. пурпуровая (I. purpurea) як дэкаратыўная. Павойная расліна з буйнымі белымі, ружовымі, блакітнымі і фіялетавымі кветкамі, якія закрываюцца нанач. Цвіце з чэрвеня да верасня. Ёсць махровыя формы.

ІПАТЭКА (грэч. hypothēkē залог, заклад), своеасаблівы від залогу нерухомай маёмасці, пераважна зямлі, будынкаў; служыць забеспячэннем выдадзенай пазыкі. У СССР І. няма. Гл. таксама *Іпатэчны крэдыт*.

ІПАТЭЧНЫ КРЭДЫТ, у капіталіст. краінах доўгатэрміновая пазыка, якая даецца пад залог нерухомай маёмасці (зямлі, будынкаў). І. к. узнік у старажытнасці, найб. развіццё набыў пры капіталізме. За карыстанне І. к. плаціцца працэнт. За нясвоечасовае пагашэнне пазыкі і працэнтаў па ёй маёмасць (залог) прадаецца. За кошт выручкі доўг і працэнты пагашаюцца. Калі маёмасць не прадаецца, залог пераходзіць ва ўласнасць крэдытора. Даюць І. к. спец. *іпатэчныя банкі*. Пазыкі выдаюцца гатоўкаю і закладнымі лістамі (разнавіднасць каштоўных папер), якія выпускаюцца гэтымі банкамі і рэалізуюцца звычайна курсам ніжэй за намінал. І. к. паскарае збяднение сялянства і вядзе да канцэнтрацыі зямельнай уласнасці ў руках фін. капіталу. Гл. таксама *Банкі, Крэдыт*.

Літ.: Экономика Белоруссии в эпоху империализма. 1900—1917, Мн., 1963, гл. 8.

ІПАТЭЧНЫЯ БАНКІ, у капіталіст. краінах спецыялізаваныя банкі, якія выдаюць *іпатэчны крэдыт*. У дарэвалюц. Расіі адыгрывалі вял. ролю ў фінансаванні памешчыцкіх і кулацкіх гаспадарак. Пазыкі дзярж. Дваранскага зямельнага банка памешчыкам пад залог зямлі павялічыліся за 1900—14 з 600 да 894 млн. руб. Дзейнічалі на тэр. Беларусі (гл. *Банкі*).

ІПАХОНДРЫЯ (грэч. hypochóndrion падрабрынне; стараж. грэкі лічылі хваробы ў вобласці падрабрыння прычынай І.), хваробны стан, які характарызуецца празмерным страхам за сваё здароўе. Бывае пры шызафрэніі, псіхапатыях, маніякальна-дэпрэсіўным псіхозе і інш.

ІПАЦЬЕЎ Аляксандр Мікалаевіч [17(30).6.1911, г. Растоў-на-Доне — 8.8.1969], беларускі савецкі вучоны ў галіне біялогіі і селекцыі с.-г. раслін. Чл.-кар. АН БССР (1969). Д-р с.-г. н., праф. (1960). Скончыў Маскоўскі с.-г. ін-т (1934). Заг. кафедры селекцыі плодаагародніных культур Омскага с.-г. ін-та (1936—45). У 1948—61 заг. кафедры плодаагародніцтва Бел. с.-г. акадэміі; у 1962—65 праф. кафедры сістэматыкі раслін БДУ. Заг. кафедры пладаводства Бел. с.-г. акадэміі (1965—69). Асн. працы па сістэматыцы, селекцыі, насенняводстве плодаагародніных культур. Вёў даследаванні па вывучэнні сусветнага багацця агародніных культур.



Тв.: Мировое овощеводство, Тамбов, 1948; Парнікі і цяпліцы, Мн., 1955; Частная селекция овощных культур, Мн., 1965; Овощные растения земного шара, Мн., 1966.

Літ.: Александр Николаевич Ипатьев, «Генетика», 1970, т. 6, № 5.

ІПАЦЬЕЎСКІ ЛЕТАПІС, помнік культуры і гісторыі ўсх. славян, адзін з найбольш стараж. твораў паўднёварускага летапісання. Назву атрымаў па спісе, знойдзеным у Іпацьеўскім манастыры каля Кастрамы.

Акрамя І. л. пач. 15 ст., вядомыя Хлебнікаўскі, Ермалаеўскі і інш. спісы. Складаецца з 3 частак: «*Повести временных лет*» («Аповесці мінулых часоў», аверткі да 1117 уключна), Кіеўскага летапісу (1118—99) і *Галіцка-Валынскага летапісу* (1201—91). І. л.— важная крыніца па гісторыі Кіеўскай, Галіцка-Валынскай і Полацкай Русі, а таксама Вял. кн. Літ. 13 ст. Здаўна вядомы на Беларусі, у 16 ст. ім карысталіся аўтары *Хронікі Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага* і *Быхаўца летапісу*. Адзіны помнік, у якім, паводле меркаванняў некат. вучоных, асталіся ўрыўкі згубленага *Полацкага летапісу*.

Публ.: Полное собрание русских летописей, т. 2 — Ипатьевская летопись, М., 1962.

Літ.: Шахматов А. А. Обозрение русских летописных сводов XIV—XVI вв., М.—Л., 1938; Пашуто В. Т. Очерки по истории Галицко-Волынской Руси, М., 1950. *В. А. Чамярыцкі*. Мінск.

ІПРЫТ (2, 2′-дыхлордыэтылсульфід, «гарчычны газ»), $S(CH_2CH_2Cl)_2$, арганічнае рэчыва з класа тыяэфіраў. Вельмі атрутнае рэчыва скуранарыўнога і агульнатаксічнага дзеяння. Бясколерная масляністая вадкасць з t пл. 14 °С, t кіп. 217 °С; шчыльнасць 1274,1 кг/м³. Тэхн. І. слаба пахне гарчыцаю. Упершыню ўжыты нямецкімі войскамі ў 1917 каля г. Іпр (адсюль назва). Дэгазатары І.— хлорная вапна і хларамін. Засцерагаюць ад І. процівагаз і процііпрытнае адзенне. Гл. таксама *Атрутныя рэчывы*.

ІПУЦЬ, рака, левы прыток Сажа (бас. Дняпра). Даўж. 437 км, у БССР каля 105 км. Пачынаецца ў Магілёўскай вобл., цячэ ў Смаленскай, Бранскай і Гомельскай абласцях. Рэльеф вадазбору (10 900 км²) — плоская, моцна перасечаная раўніна, складзеная з суглінкаў і супескаў. Пад балотамі 11%, пад лесам 25, разарана 50% тэр. Шыр. даліны 2,5—3 км.



Гал. прытокі: левыя — Вароніца, Надва, Варануса, Унеча, правыя — Віхолка, Ачоса. Ледастаў з пач. снеж. да канца сак.— пач. красавіка. Разводдзе з канца сак. да канца мая, вада падымаецца над межанным узроўнем на 3—4 *м*. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 56 *м³/сек*. Мае меліярацыйна-лесасплаўное значэнне. На рацэ — г. Сураж і Добруш, каля іх плаціны. *Н. Дз. Шэка.* Мінск.

ІРАВАДЗІ, рака ў Бірме. Даўж. 2150 *км*, пл. бас. 430 тыс. *км²*.

Пачынаецца І. на паўд.-ўсх. ускраіне Тыбецкага нагор'я на тэр. Кітая. Цячэ большай ч. па міжгорнай даліне. Упадае ў Андаманскае м. (дэльта каля 30 тыс. *км²*). Гал. прытокі: левы М'інге, правы Чындуін. Жыўленне пераважна дажджавое. Сярэдні гадавы расход вады ў пач. дэльты 13 600 *м³/сек*. Рэжым мусонны, найб. расход у жн.—вер., найменшы ў сак.— крас. Суднаходная ад вусця на 1440 *км*. На І.— г. Мандалай і Рангун.

ІРАД І (Ірад Вялікі; каля 73—4 да н. э.), цар Іудзеі [40—4 да н. э.]. Стаўленік рымлян, актыўна праводзіў рымскую палітыку. Заснаваў г. Цэзарэя, пабудаваў іерусалімскі палац і інш. будынкі ў Малой Азіі і Грэцыі. Пасля ўзбр. барацьбы перамог прэтэндэнта на царскі трон Антыгона (з дынастыі Хасманеяў), бязлітасна расправіўся з яго паслядоўнікамі (пакараў смерцю сваю жонку, траіх сыноў). Жорстка душыў нар. паўстанні. Пазней стаў гал. персанажам евангельскага міфа пра «выпішчэнне немаўлят».

ІРАДЫЯЦЫЯ (у фізіялогіі), распаўсюджванне ўзбуджэння ці тармажэння ў цэнтр. нерв. сістэме.

ІРАК (Іракская Рэспубліка), дзяржава ў Паўд.-Зах. Азіі. Пл. 434,9 тыс. *км²*. Нас. каля 9,5 млн. чал. (1970). Сталіца Багдад. Падзяляецца на 16 мухафазаў. І., паводле часовай канстытуцыі 1970, нар.-дэмакр. рэспубліка. Вышэйшы орган дзярж. улады — Савет рэвалюц. камандавання, старшыня якога адначасова ўзначальвае дзяржаву і ўрад. [На ўклейцы: каляровая карта Ірак, Іран.]



Прырода. Большая частка тэр. краіны занята Месапатамскай нізінай, складзенай з рачных наносаў рэк Тыгра і Еўфрата. Паўд. частка яе забалочана, многа азёраў. Нізіна нахілена з ПнЗ на ПнУ. На Пн і ПнУ — ускраіна Армянскага і Іранскага нагор'яў з хрыбтамі выш. да 3 тыс. *м*. Зах. частку займае плато Сірыйская пустыня з сярэднімі выш. 300—400 *м*. Карысныя выкапні: нафта, прыродны газ, асфальт, фасфарыты, кам. соль, жал. руда. Клімат паўн. часткі міжземнаморскі, паўд.— сухі, трапічны. У межах раўнін сярэднія т-ра студз. ад 7 на Пн да 11 °С на Пд, чэрв. ад 32 на Пн да 34 °С на Пд. Ападкаў ад 500 *мм* на Пн да 60—100 *мм* за год на ПдУ. Тэрыторыю І. сярэднім і ніжнім цячэннем перасякаюць Тыгр і Еўфрат, якія зліваюцца і ўтвараюць Шат-эль-Араб. Выкарыстоўваюцца на арашэнне. У пустынных раёнах рэкі маюць характар часовых вадатокаў (вадзі). Расліннасць паўпустынная, на ПдЗ пустынная. На Месапатамскай нізіне пераважае саланчакова-лугавая раслінасць з салянкамі, палынамі, вярблюджымі калючкамі; у гарах калючыя хмызнякі і рэдкія дрэвы фісташкі, смакоўніцы і інш. Жывёльны свет: на раўнінах газель, дзікі асёл, паласатая гіена, шакал, леапард; многа паўзуноў і грызуноў, разнастайныя птушкі.



Ірак. Курды-качэўнікі ў гарах.

Насельніцтва. Пераважаюць арабы (75%) і курды (каля 20%), жывуць туркмены, персы, армяне, айсоры і інш. Дзярж. мовы — арабская і курдская. Большасць веруючых—мусульмане. Сярэдняя шчыльн. нас. 19,3 чал. на 1 *км²*. Найб. густа заселены даліны Тыгра, Еўфрата, Шат-эль-Араба і перадгор'і на Пн краіны. Гарадскога нас. 44% (1965). Найб. гарады: Багдад (больш за 1,1 млн. ж., 1968), Басра, Масул.

Гістарычны нарыс. На тэр. сучаснага І., якая ў асн. супадае з *Месапатаміяй*, існавалі стараж. цывілізацыі. У 3 — пач. 2-га тысячагоддзя да н. э. былі раннекласавыя гарады-дзяржавы (Ур, Ніпур, Лагаш, Урук і інш.). У сярэдзіне 6 ст. да н. э. тэр. І. ўваходзіла ў *Ахеменідаў дзяржаву*, у 4 ст. да н. э. ў дзяржаву Аляксандра Македонскага, потым у *Селеўкідаў дзяржаву*, у *Парфянскае царства*. У 30-я г. 7 ст. тэр. І. завалодалі арабы. Большасць насельніцтва прыняла іслам і араб. мову. У 11 ст. усю тэр. І. захапілі сельджукі (гл. *Сельджукская дзяржава*), у 13 ст. манголы. У 14—15 ст. тэр. І. ўвайшла ў імперыю Цімура. Пасля яе распаду стала арэнай барацьбы паміж асобнымі правадырамі мангола-цюркскіх родаў, а потым паміж сефевідамі (гл. *Сефевідаў дзяржава*) і туркамі. З 17 ст. і да канца 1-й сусв. вайны 1914—18 тэр. І. ўваходзіла ў *Асманскую імперыю*. З канца 16 ст. І.— аб'ект экспансіі еўрап. дзяржаў, асабліва Англіі, у апошняй чвэрці 19 ст. Германіі. У 1917—18 англ. войскі акупавалі б. ч. Месапатаміі, Багдад і багаты нафтай Масульскі вілает. У крас. 1920 Вялікабрытанія атрымала мандат Лігі нацый на нанавастворваную дзяржаву І. Іракскія патрыёты вялі барацьбу супраць каланізатараў, якая асабліва абвастрылася пад уплывам Вял. Кастр. сацыяліст. рэвалюцыі. Улетку 1920 усю краіну ахапіла нац.-вызв. паўстанне. Англ. ўрад мусіў змяніць формы панавання ў І. У 1920 створаны «нацыянальны ўрад» І., які поўнасцю залежаў ад Вялікабрытаніі, у жн. 1921 І. абвешчаны «незалежным каралеўствам» на чале з эмірам. У 1922 Вялікабрытанія заключыла з І. т. зв. саюзны дагавор. Ён замацоўваў англ. панаванне ў І. Падпісаны ў 1930 англа-іракскі дагавор захоўваў паліт., эканам. і ваен. пазіцыі Вялікабрытаніі ў І. У 1932 англ. мандат

Багдад. Набярэжная Абунавас.



страціў сілу. І. фармальна абвешчаны незалежным, прыняты ў Лігу нацый. Аднак англ. саветнікі мелі вырашальны ўплыў у дзярж. апараце, у краіне асталіся англ. ваен. базы, іракскай нафтай распараджаліся імперыял. манаполіі. Галеча і паліт. бяспраўе нар. мас — прычына шматлікіх выступленняў іракскіх патрыётаў. У 30-я г. ў барацьбу актыўна ўключыўся рабочы клас. У 1934 засн. Іракская камуніст. партыя (ІКП). Апазіцыя ўраду расла і сярод нац. буржуазіі, у арміі. У кастр. 1936 група афіцэраў зрабіла пераварот. Новы ўрад, які ўзначаліў адзін з лідэраў патрыят. арг-цыі Ахалі (створана ў 1931) Хікмет Сулейман, вызначыў праграму дэмакр. пераўтварэнняў. Аднак у жн. 1937 уладу зноў захапілі праангл. колы. Пасля таго як Вялікабрытанія абвясціла фаш. Германіі вайну, урад І. разарваў (5.9.1939) дыпламат. адносіны з Германіяй. Асн. галіны іракскай эканомікі і гандаль былі пастаўлены пад непасрэдны кантроль англ. саветнікаў. У 1941 пачалося паўстанне супраць брыт. панавання. Англ. войскі задушылі яго і акупавалі І. Пад нацыскам барацьбы «за правы працоўных», у арганізацыі якой значная роля належала ІКП, урад І. крыху палепшыў (1942) умовы працы рабочых. У 1943—44 з турмаў і лагераў вызвалена частка палітвязняў. У жн. 1944 прынята рашэнне пра абмен дыпламат. місіямі з СССР. У гады вайны асабліва цяжкім было становішча курдскага насельніцтва. У 1943 пачалося паўстанне курдаў, якое ахапіла ўсе паўн. правінцыі. Пасля правалу карнай экспедыцыі супраць паўстанцаў урад паабяцаў (1944) курдскім правінцыям аўтаномію, аднак у жн. 1945 кінуў войскі супраць паўстанцаў. У кастр. 1945 курды мусілі спыніць супраціўленне. Пасля 2-й сусв. вайны нац.-вызв. рух у І. ўзмацніўся. Нягледзячы на рэпрэсіі, у час якіх пакараны смерцю (1949) ген. сакратар ЦК ІКП Юсеф Сальман Юсеф (Фахед) і некат. іншыя кіраўнікі ІКП, выступленні нар. мас не спыняліся. У адказ на іх урад забараніў усе паліт. партыі. Тысячы прагрэс. дзеячаў былі кінуты ў турмы і ў канцлагеры. У 1954 І. заключыў пагадненне з ЗША пра ваен. дапамогу, у лютым 1955 падпісаў дагавор з Турцыяй пра ўзаемнае супрацоўніцтва, які быў пачаткам стварэння агрэсіўнага Багдадскага пакта (гл. *Арганізацыя цэнтральнага дагавору*). У студз. 1955 іракскі ўрад абвясціў пра спыненне дыпламатычных адносін паміж І. і СССР. Масавы пратэст працоўных краіны з выпадку *англа-франка-ізраільскай агрэсіі* супраць Егіпта перарос у ліст. 1956 ва ўзбр. паўстанне. У 1957 у падполлі створаны Фронт нацыянальнага адзінства (ФНА). Ён наладзіў сувязь з падпольнай арганізацыяй «Свабодныя афіцэры», якая з 1956 дзейнічала ў арміі.

14.7.1958 у краіне адбыўся рэвалюц. пераварот. І. абвешчаны рэспублікай. Былі ліквідаваны англ. ваен. базы, анулявана большая частка кабальных дагавораў з зах. краінамі, адноўлены дыпламат. адносіны з СССР і ўстаноўлены з некат. інш. сацыяліст. краінамі. У 1958 прыняты закон пра аграрную рэформу. У 1958—59 паміж І. і СССР заключаны пагадненні, накіраваныя на ўмацаванне іракскай нац. эканомікі. У 1959 І. выйшаў з Багдадскага пакта. Развіццё краіны ў дэмакр. кірунку напалохала ўнутр. рэакцыю. Абвастрылася класавая барацьба. Урад А. К. Касема [ліп. 1958 — люты 1963] пайшоў на абмежаванне дзейнасці прагрэс. грамадскіх арг-цый, пачаў вайну супраць курдаў. Раскол нац. адзінства і задушэнне дэмакр. свабод прывялі да ізаляцыі Касема. 8.2.1963 адбыўся дзяржаўны пераварот. Да ўлады прыйшло крайне правае крыло Партыі арабскага сацыялістычнага адраджэння (БААС). Пачалася кампанія масавага тэрору. У сак. 1963 пакараны смерцю ген. сакратар ЦК ІКП Салям Адыль і многія інш. дзеячы кампартыі. У 1963 зноў пачаліся ваен. дзеянні супраць курдаў. Рэакц. палітыка ўрада выклікала незадаволенасць у краіне і ў самой партыі БААС. 18.11.1963 адбыўся новы дзярж. пераварот. Уладу захапіла ваен. групоўка, якую падтрымлівалі памяркоўныя колы БААС. Пад уплывам гэтых колаў у краіне ажыццёўлены некат. сац.-эканам. мерапрыемствы. У ліп. 1967 атрымала амністыю група палітвязняў, 7 жн. выдадзены закон, паводле якога адабраныя ў 1961 у замежных нафтавых манаполій землі перадаваліся іракскай нафтавай кампаніі. Аднак урад не выканаў свайго рашэння пра аўтаномію курдаў, адтэрмінаваў выбары ў парламент. Незадаволенасць такой палітыкай — прычына чарговага дзярж. перавароту (17.7.1968). Уся ўлада перайшла да Савета рэвалюц. камандавання. Прэзідэнтам краіны стаў генерал Ахмед Хасан аль-Бакр (партыя БААС). З турмаў вызвалена каля тысячы патрыётаў, у т. л. членаў ІКП. 15.7.1969 прыняты закон аб пенсіях і сац. забеспячэнні. 11.3.1970 абнародавана дэкларацыя ўрада пра мірнае ўрэгуляванне курдскай праблемы (унутраная аўтаномія ў межах І.), 16.7.1970 — тэкст новай часовай канстытуцыі, паводле якой І.— нар.-дэмакр. рэспубліка. Урад І. паслядоўна праводзіць антыімперыял., антыкалан. палітыку. І.— чл. Лігі арабскіх краін (з 1945). Выступае за ліквідацыю вынікаў *ізраільскай агрэсіі* на Б. Усходзе. 17.1.1969 падпісана савіракскае пагадненне пра супрацоўніцтва ў рыбалоўстве, у 1970 пагадненне пра геал. і гідралагічныя даследаванні. З ліст. 1968 у Багдадзе дзейнічае Т-ва дружбы «Ірак—СССР». З 1945 І.— чл. ААН.

Мітынг працоўных Багдада ў падтрымку рашэння ўрада пра спыненне вайны з курдамі. 1970.



Гаспадарка. І.— аграрная краіна. У эканоміцы важнае месца належыць здабычы нафты. У дзярж. даходах паступленні ад яе складаюць больш за 60%. Амаль усе нафтапромыслы кантралююцца замежным капіталам, пераважна Вялікабрытаніі, ЗША, Францыі, якія ў 1970 здабылі 75,6 млн. *т* нафты. Раёны здабычы: Кіркук і Масул, Басра і Ханакін. З паўн. раёнаў нафта перапампоўваецца па нафтаправодах у порты Трыпалі (Ліван) і Баніяс (Сірыя), а з паўд.— у порт Фао. Частка нафты перапрацоўваецца на нафтаперапр. з-дах І., найб. з-д у Эд-Дауры, каля Багдада. Здабываюць прыродны газ, жал. руду, кам. вугаль, асфальт, серу. У с. гасп. (26% нац. даходу) занята больш за 70% самадзейнага насельніцтва. Пасля 1958 у І. праводзіцца агр. рэформа. Абмяжоўваюцца памеры землеўладанняў і арэндная плата. Канфіскаваная дзяржавай зямля перадавалася беззямельным сялянам за плату, а з мая 1969 — бясплатна. На канец 1968 у буйных землеўладальнікаў канфіскавана каля 1,8 млн. *га*, 688 тыс. *га* размеркавана сярод 57 тыс. сем'яў. 443 с.-г. кааператывы аб'ядноўвалі 60 тыс. сялянскіх сем'яў (1968). Створаны (з дапамогаю СССР) машынапракатныя станцыі і дзярж. гаспадаркі. Апрацоўваецца каля 8 млн. *га* зямлі, з іх 60% арашаецца. Больш за 40% зямлі, якая апрацоўваецца, занята збожжавымі, пераважна пшаніцай і ячменем. Збор (тыс. *т*, 1970) і раёны вырошчвання гал. с.-г. культур: пшаніцы 1054 (Пн і ПнУ), ячменю 700 (цэнтр. частка краіны), рысу 203 (Пд). На Пд краіны вял. плантацыі фінікавай пальмы (збор 370 тыс. *т*, 1969). Развіта садоўніцтва, вінаградарства і агародніцтва. Жывёлагадоўля пераважна качавая. У 1968 было (млн. галоў): буйн. раг. жывёлы 1,7, авечак 11, коз 1,8, аслоў 0,5. Гадуюць коней, мулаў, вярблюдаў. Прамысловасць развіта слаба, акрамя нафтаздабыўной і нафтаперапрацоўчай. Апрацоўчая прамысл. дае 11% нац. даходу, у ёй занята 150 тыс. чал. (1969), у т. л. 48,4 тыс. на 300 прадпрыемствах дзярж. сектара. Лепш развіта харчовая (Масул), тэкст. (Багдад, Кут, Масул) прамысловасць і вытворчасць буд. матэрыялаў (Сулейманія, Масул, Эль-Куфа, Ум-Каср, Самава). Пераважаюць дробныя прадпрыемствы. Развіта саматужная вытворчасць саф'янавага абутку, дываноў, ювелірных вырабаў, посуду, саламяных цыновак. У Эль-Махмудыі веласіпедны з-д. З дапамогаю СССР пабудавана больш за 30 прадпр.: эл.-тэхн. з-д і атамны н.-д. цэнтр у Багдадзе, кансервавы з-д у Кербеле, бавоўняны камбінат у Куце і інш.; будуецца (1972) канал Тыгр — Еўфрат. Даўж. чыг. каля 2 тыс. *км*, аўтамаб. дарог 18 тыс. *км*. Суднаходства па рэках Тыгр і Шат-эль-Араб. Важныя порты: марскі — Басра, рачны — Багдад. Найб. аэрапорт Блізкага і Сярэдняга Усходу ў Багдадзе. Значная сетка нафтаправодаў. Экспарт (23 млн. дынараў, без нафты): фінікі (каля 80% сусв. экспарту), ячмень, цэмент, скуры, воўна, бавоўна; імпарт (144 млн. дынараў): цукар, чай, тэкстыль, машыны, абсталяванне, металы, лес. Гандл. партнёры па імпарце: Вялікабрытанія, СССР, Японія, ФРГ, Францыя, Італія; па экспарце: Кувейт, Ліван, Кітай, АРЕ, СССР. Грашовая адзінка — дынар.

Суднаходны канал каля Басры.



Асвета, навуковыя ўстановы. У манархічным І. каля 80% мужчын і 95% жанчын былі непісьменныя. У 1958 урад прыняў меры для развіцця асветы: пачалося буд-ва школ, створаны курсы падрыхтоўкі настаўнікаў пач. школ, цэнтры па ліквідацыі непісьменнасці. Дзіцячыя сады для дзяцей 4—6 гадоў. У 1967/68 іх наведвала 16,7 тыс. дзяцей. Школы дзяржаўныя і прыватныя. Навучанне пераважна раздзельнае. Пач. школа 6-гадовая ў горадзе, 4-гадовая на вёсцы. Сярэдняя школа 5-гадовая (3-гадовая прамежкавая і 2-гадовая асн. сярэдняя). У 1967/68 навуч. г. ў пач. школах навучалася 1007,9 тыс. дзяцей, у сярэдніх 254 тыс. чал. Прафесійныя камерцыйныя і с.-г. школы на базе прамежкавай школы, прафесійна-тэхн.— на базе пач. школы. У 1967/68 навуч. г. ў прафесійных школах навучалася 10,2 тыс. чалавек. ВНУ: Багдадскі ун-т. СССР памагае рыхтаваць нац. тэхн. кадры. Б-кі: публічная ў Масуле, б-ка музея І. Музеі: музей І., старажытнай зброі, этнаграфіі, прыродазнаўчагістарычны. У І. Іракская акадэмія, НДІ засушлівай зоны, Аддзел навук. і індустр. даследавання, Цэнтр яд. даследавання (Іракская камісія па атамнай энергіі), Ін-т ісп.-араб. культуры і інш.

Літаратура. Новая л-ра І. ўзнікнулася адрадзіць колішнюю славу арабскай л-ры (гл. *Арабы*, раздз. Літаратура). На мяжы 19—20 ст., з зараджэннем капіталіст. адносін у І. ажывілася культ. жыццё; паліт. ўздым адлюстравалі паэты Джэмаль Сідкі аз-Захаві, Мааруф ар-Русафі і інш. Многія паэты, абураныя ўсталяваннем улады англічан у І., натхняліі народ на барацьбу (Мухамед Махдаі аль-Джавахіры, Мухамед Салік Бахр аль-Улюм і інш.). Першыя празаічныя творы — апавяданні — пачалі з'яўляцца ў 20-я г. (Махмуд Ахмед ас-Саід, Зу-н-Нун Аюб). У 40—50-я г. развіваўся рэалістычны кірунак. У 2-ю сусветную вайну і ў першыя гады пасля яе ў паэзіі панавалі фармаліст. школы, станоўчае ў іх дзейнасці — адмаўленне ад кананічных выфмаў і памераў (Назік аль-Малаіка, Баланд Хайдары). Пасля 1958 з'явіліся новыя прагрэс. паэты Хасан аль-Баяці, Саад Юсеф, Рушда аль-Аміль, творчасць якіх мае глыбока сац. характар.

Архітэктура. Стараж. паселішчы на тэр. І. вядомы з 4-га тысячагоддзя да н. э. Ва ўмацаваных гарадах Вавілоніі і Асірыі (Уры, Лагашы, Вавілоне, Ашуры) будаваліся зікураты, палацы з насценнымі рэльефамі. У часы Халіфата (7—10 ст.) узніклі гарады Куфа, Багдад, Самара, ставіліся палацы (Ухайдзір). Сярэдневяковыя будынкі з традыц. для архітэктуры І. 4-айванным планам мелі і рысы іранскай архітэктуры (цыліндрычныя мінаэты, цагляны арнамент, разьба па тэракоце). У 13 ст. будуюцца маўзалеі з шатровымі ячэйкавымі купаламі (маўзалей Зубайды ў Багдадзе), у 16 ст.— аздобленыя бірузовай кафляй пахавальні з пазалочанымі купаламі. У сярэдзіне 20 ст. архітэктары Х. Мунір, К. аль-Мадфаі, Р. аль-Чадэрчы і інш. ствараюць будынкі на ўзроўні сучаснай буд. тэхнікі з выкарыстаннем сонцазасцерагальных прыстасаванняў. Ажыццяўляецца рэканструкцыя Багдада і інш. гарадоў.

Літ.: Луцкий В. Б. Новая история арабских стран, 2 изд., М., 1966; Новейшая история арабских стран, М., 1968; Данциг Б. М. Ирак в прошлом и настоящем, М., 1960; Федченко А. Ф. Ирак в борьбе за независимость, М., 1970; Милованов И. В. и Сейфуль-Мулюков Ф. М. Ирак вчера и сегодня, М., 1959; Ментешашвили А. М. Ирак в годы английского мандата, М., 1969; Современный Ирак (Справочник), М., 1966; Мирский Г. Ирак в смутное время. 1930—1941, М., 1961; Герасимов О. Г. Иракская нефть, М., 1969; Ягo ж. 10 000 километров по Месопотамии, М., 1968; Пегов С. С. и Алпатовский С. Н. Ирак, М., 1966; Всеобщая история архитектуры, т. 1, М., 1970; т. 8, М., 1969.

К. А. Альбіцкая (гаспадарка, насельніцтва), *Б. М. Данцыг, А. Ф. Федчанка, М. П. Пайлаў* (гістар. нарыс), *З. К. Навоціна* (асвета), *Т. М. Любімава* (літаратура), *В. Л. Вароніна* (архітэктура). Масква.

ІРАН, дзяржава ў Паўд.-Зах. Азіі. Пл. 1648 тыс. км². Нас. 29,3 млн. чал. (1971). Сталіца Тэгеран. І. падзяляецца на 14 астанаў і 6 губернатарстваў. [На ўклейках: каляровая карта Ірак, Іран і ін.]



Дзяржаўны лад. І.— канстытуцыйная манархія. Канстытуцыю складаюць Асноўны закон 1906 і дадаткі да яго 1907 і 1967. На чале дзяржавы шах. Заканадаўчую ўладу ажыццяўляюць шах і парламент. Парламент складаецца з 2 палат — меджліса (нац. савета), які выбіраецца на 4 гады, і сената, палавіна членаў якога назначаецца шахам, палавіна выбіраецца на 6 гадоў. Выканаўчую ўладу ажыццяўляе ўрад, які назначаецца шахам.

Прырода. І.— горная краіна. Усю ўнутр. частку займае Іранскае нагор'е, акаймаванае маладымі горамі: на Пн — Талышскія горы, Баграўдаг, Эльбурс з найвыш. пунктам Ірана г. Дэмавенд (5604 *м*) і Туркмена-Харасанскія; на У горныя хрыбты Каен, Пеленган і горы Серхед; на Пд і ПдЗ — горы Макрана і Загрос. Паўн.-зах. частка І. занята Армянскім нагор'ем. Уздоўж узбярэжжаў вузкія палосы прыбярэжных нізін. Бываюць землетрасенні. Карысныя выкапні: нафта, прыродны газ, кам. вугаль, жал. руда, каляровыя металы, сера, соль, гіпс і інш. Клімат субтрапічны кантынентальны, на Пд пераходны да трапічнага. Сярэдняя т-ра студз. ад −2 на Пн да 14 °С на Пд, ліп. ад 25 на Пн да 31 °С на Пд. Ападкаў на большай частцы ўнутраных раёнаў І. ад 30 да 500 *мм* за год (пераважна зімою і вясною), максімум (1000—2000 *мм* за год) — на Каспійскім узбярэжжы. Рэкі малаводныя, некат. перасыхаюць. Цэнтр. частка Іранскага нагор'я бяссцёкавая. Значныя рэкі: Аракс, Сефідруд, Шат-эль-Араб з прытокам Карун. Выкарыстоўваюцца на арашэнне. Вял. бяссцёкавыя азёры Рэзае (5,8 тыс. км²), Дэр'ячэ-Немек (да 3 тыс. км²). Ва ўнутр. раёнах пераважаюць пустынныя шэраземы і саланчакі, у Прыкаспіі — лясныя бураземы, у гарах — бурыя і каштанавыя глебы. На Пд пашыраны чырваназемастопавыя глебы; па рачных далінах — алювіяльныя. Расліннасць пераважна пустынная і горна-ксерафітная. У Прыкаспіі шыракалістыя лясы з буку, дубу, клёну, грэцкага арэха, самшыту, на схілах Загроса — дубова-фісташкавыя лясы з міртам, гранатнікам. Горы ўнутранай і паўд.-зах. часткі Іранскага нагор'я ўкрыты травяной стэпавай расліннасцю. Жывёльны свет багаты і разнастайны. У лясах на Пн трапляюцца тыгр, леапард, барс, паласатая гіена. У бязлесных гарах і пустынях фаўна сярэднеазіяцкага тыпу, а на Пд яшчэ і паўднёваазіяцкія віды (лятучы сабака, мангуста і інш.). Вял. шкоду с. гасп. робіць саранча.

Насельніцтва. Больш за 50% — персы (іранская моўная група), каля 20% азербайджанцы (цюркская моўная група). Да іранскай моўнай групы належаць, акрамя персаў, курды, луры, бахтыяры (З і ПдЗ), белуджы (ПдУ), гілянцы і мазендэранцы (Пн), талышы і таты (ПнЗ), таджыкі, афганцы і інш., да цюркскай — афшары, каджары, кашкайцы, туркмены, карапапахі — жывуць па ўсёй краіне. Есць арабы (ПдЗ і Пд), невялікія групы армян, грузін, яўрэяў. Больш за 3 млн. качэўнікаў. Дзярж. мова — персідская (фарсі), рэлігія — іслам. Гарадскога нас. 39,1% (1966). Найб. гарады (тыс. чал., 1966): Тэгеран (2719,7), Ісфахан (424,0), Мешхед (409,6), Тэбрыз (403,4), Абадан (273,0), Шыраз (269,9).

Гістарычны нарыс. Тэр. сучаснага І. паводле археал. звестак заселена чалавекам з канца ніжняга палеаліту. У 3-м тысячагоддзі да н. э. існавала старажытная дзяржава *Элам*. Асаблівага росквіту Эламская раннерабаўладальніцкая дзяржава дасягнула ў 13—12 ст. да н. э., займала на той час тэр. ад р. Еўфрата да Цэнтр. І. У 9—8 ст. да н. э. некат. раёны І. далучаны да Асірыі. У выніку паўстання груп важакоў плямёнаў мідзян (жылі на тэр. Іранскага нагор'я) у паўн.-зах. частцы нагор'я і паўд. Азербайджане ўзнікла царства *Мідыя*. Пасля вайны 553—550 да н. э. з падпарадкаваным ёй царствам Персідай улада перайшла да перс. дынастыі Ахеменідаў (гл. *Ахеменідаў дзяржава*). Заснавальнік дынастыі Кір II завалваў М. Азію, Вавілонію, Сірыю і Палесціну, частку Сярэдняй Азіі. Пазней быў завалваны Егіпет. У 330 да н. э. дзяржаву Ахеменідаў завалваў Аляксандр Македонскі. Пасля 312 да н. э. тэр. І. ўвайшла ў *Селеўкідаў дзяржаву*, у сярэдзіне 2 ст. да н. э.— у Парфянскае царства. Цар залежнай ад яго Персіды перамог у 224 н. э. парфянскага цара і стварыў *Сасанідаў дзяржаву*. Мяркуецца, што ў 3—5 ст. адбываўся пераход ад рабаўладальніцкіх да феад. адносін. Абвастрыліся класавыя супярэчнасці. У 488—528 (ці 529) краіну ахапіў магутны народны т. зв. Маздакіцкі рух супраць феад. заняволення землеўладальніцкіх абшчын і самавольства феадалаў. Сасаніды бязлітасна расправіліся з удзельнікамі руху, умацавалі сваё становішча ў краіне, значна пашырылі тэр. дзяржавы.

Доўгія войны і феад. міжусобіцы аслабілі краіну. У 7 ст. яе заваявалі арабы. Пашыраўся іслам, у канцы 10 ст. ён стаў рэлігіяй большасці насельніцтва. Нар. рух супраць араб. панавання, узмацненне працэсу феадалізацыі і сепаратызм мясцовых феадалаў аслабілі ўладу арабаў. У 9—10 ст. на тэрыторыі І. склаліся спадчынныя эміраты. У 900 Усх. Іран увайшоў у дзяржаву Саманідаў, на З утварылася *Буідаў дзяржава*. Уварванне цюркаў-агузаў на тэр. І. закончылася ў 11 ст. заваяваннем яе. У 12 ст. яна распалася на шэраг султанатаў. Барацьба паміж асобнымі дынастыямі прывяла да заняпаду гандлю, рамяства і земляробства. Аслабленая краіна ў 13 ст. заваявана манголамі, паміж 1380—93 войскамі Цімура. Пасля яго смерці (1405) у І. правілі асобныя ханы. У 16 ст. значна выраслa роля буйных феадалаў. Яны неспыннаваявалі паміж сабою. У пач. 16 ст. перамагла дынастыя Сефевідаў (гл. *Сефевідаў дзяржава*). Пры іх умацавалася цэнтр. ўлада. У час праўлення Абаса I [1587—1629] дзяржава была асабліва магутнай. Развіваліся таварная вытворчасць, с. гасп., гандаль, рамёствы. З 2-й пал. 17 ст. пачаўся эканам. і паліт. спад. Абвастрылася барацьба за ўладу паміж асобнымі групоўкамі феад. вярхоў, паміж духавенствам і свецкімі феадаламі. Сац. і нац. прыгнёт — прычына неаднаразовых паўстанняў сялян і гараджан (канец 17—18 ст.). Асабліва ўпартыя былі выступленні армян і азербайджанцаў. Пад ударамі (1722) афганцаў-гільзаяў дзяржава Сефевідаў распалася. У 1723 у паўн.-зах. і цэнтр. раёны краіны ўварваліся туркі. Народны рух супраць афганцаў (1726—30) і за выгнанне туркаў (1730—36) узначаліў Надзір-хан Афшар. У выніку шматлікіх ваенных паходаў ён стварыў велізарную феадальную імперыю. Пасля забойства ў 1747 Надзір-шаха імперыя распалася. 50 гадоў у краіне не спынялася феад. ўсобіца, якая прывяла да паліт. і эканам. заняпаду. У канцы 18 ст. да ўлады прыйшла Каджарская дынастыя [1796—1925]. Яна не дамаглася цэнтралізацыі ўлады і ўмацавання эканомікі. З канца 18 ст. І.— аб'ект экспансіі еўрап. капіталіст. краін, асабліва Вялікабрытаніі, Францыі і царскай Расіі. У выніку англ. і франц. калан. палітыкі, а таксама рускаіранскай вайны пач. 19 ст. падпісаны нераўнапраўныя дагаворы, якія ператварылі І. у рынак збыту прамысл. тавараў еўрап. краін. Абвастрэнне сац. супярэчнасцей, рост незадаволенасці нар. мас выліліся ў бабідскія паўстанні 1848—52, якія аб'ектыўна былі і пратэстам супраць заняволення І. замежным капіталам. Паражэнне паўстанняў спрыяла яшчэ большай залежнасці І. Склаўся рэакц. саюз іранскіх феад. вярхоў з замежнымі імперыялістамі. На пачатак 20 ст. ператварыўся ў паўкалонію. Пад уплывам рус. рэв. 1905—07 у краіне пачалася антыімперыялл. і антыфеад. бурж. рэвалюцыя, у выніку якой абвешчана канстытуцыя, скліканы меджліс, праведзены інш. прагрэс. мерапрыемствы. Нарастанне дэмакратычнага руху выклікала трывогу англійскага імперыялізму, рускага царызму, а таксама звязаных з імі колаў іранскай буржуазіі. Аб'яднанымі сіламі яны задушылі рэвалюцыю. У 1907 заключана англа-рус. пагадненне пра падзел І. на англ. і рус. сферы ўплыву і нейтральную зону. У 1-ю сусв. вайну І. стаў арэнай ваен. дзеянняў двух імперыял. блокаў. Паўн. раёны занялі рускія войскі, паўд.— англійскія. У сак. 1915 Вялікабрытанія і Расія заключылі сакрэтны дагавор пра падзел нейтральнай зоны.

Пад уплывам Вял. Кастр. сацыяліст. рэв. пачаўся новы ўздым антыімперыял. і дэмакр. руху. Сав. Расія анулявала ўсе нераўнапраўныя дагаворы і пагадненні з І., эвакуіравала з яго тэр. рускія войскі. У краіне адбыліся антыангл. выступленні, забастоўкі рабочых, створаны прафсаюзы. Каб задушыць нац.-вызв. рух і ператварыць І. у сваю калонію і плацдарм для барацьбы з Сав. Расіяй, Вялікабрытанія акупавала ў 1918 усю тэр. І., у 1919 навязала яму кабальнае пагадненне. Перамога Сав. улады ў Закаўказзі дала новы штуршок развіццю антыімперыял. нац.-вызв. барацьбы. У паліт. барацьбу ўступіў малады рабочы клас. У 1920 засн. Іранская камуніст. партыя (ІКП). Пад націскам нар. мас кабальны англа-іранскі дагавор ануляваны. У 1921 падпісаны сав.-іран. дагавор, які адпавядаў нац. інтарэсам іран. народа, спрыяе ўмацаванню яго незалежнасці (дыпламат. адносіны з 1921).

Пасля дзярж. перавароту 1921 у іранскім урадзе ўзмацніўся ўплыў памешчыцка-бурж. колаў. Яны пачалі барацьбу за цэнтралізацыю краіны і адначасова супраць дэмакр., рабочага і сялянскага руху. Былі разгромлены арг-цыі кампартыі і дэмакр. прафсаюзаў. У кастр. 1925 меджліс абвясціў, што Каджарская дынастыя скінута. Шахам І. стаў заснавальнік дынастыі Пехлеві Рэза-хан. Устанавіўся рэжым памешчыцка-бурж. дыктатуры. У 1927—34 прыняты новыя судовыя кодэксы, шэраг законаў і пастаноў (рэгістрацыя зямельных уладанняў, суд. рэформа, арэнда дзярж. зямель і інш.). Паскорылася развіццё бурж. адносін. У час сусв. эканам. крызісу 1929—33 абвастрылася класавая барацьба. Працоўныя ставілі не толькі эканам., але і паліт. патрабаванні. У 30-я г. ўрад І. адышоў ад палітыкі добрасуседскіх адносін з СССР, стаў на шлях збліжэння з фаш. Германіяй. Пасля нападу фаш. Германіі на СССР у І. пашырылася дзейнасць ням. агентуры. Гэта прымусіла Сав. ўрад увесці паводле ўмоў сав.-іран. дагавору ад 26.2.1921 свае войскі ў паўн. правінцыі І. Адначасова ў паўд. правінцыі былі ўведзены англ. войскі. 29.1.1942 І. падпісаў з СССР і Вялікабрытаніяй дагавор аб саюзе. У краіне адрадзіўся дэмакр. рух, разгарнулася антыфаш. барацьба, якія ўзначальвалі найб. прагрэс. патрыят. сілы І. У 1942 у І. уступілі амер. войскі. Яны ўстанавілі кантроль над паўд. портамі. З дапамогай ЗША мясцовая рэакцыя імкнулася задушыць выступленні народа. Аднак пасля перамогі над Германіяй і Японіяй дэмакр. рух набыў новую сілу. У 1945—46 у Іранскім Азербайджане і Іранскім Курдыстане створаны мясцовыя дэмакр. ўрады, ажыццёўлены прагрэс. меры. Новы ўрад А. Кавама-эс-Салтане [1946—47] павёў барацьбу з дэмакр. сіламі. Рэакцыі ўдалося задушыць дэмакр. рух. Палітыка ўрада спрыяла ўмацаванню пазіцый амер. імперыялізму ў І. Увоз амер. тавараў падарваў іранскую эканоміку. Ішло збяднение нар. мас. У 1950—51 разгарнуўся нар. рух за нацыяналізацыю прадпрыемстваў англа-іранскай нафтавай кампаніі. Пад яго націскам меджліс прыняў 15.1.1951 рашэнне нацыяналізаваць нафтавую прамысловасць. Аднак міжнар. нафтавыя манаполіі і звязаная з імі іранская агентура зрывалі яго ажыццяўленне. Пры іх падтрымцы 19.8.1953 адбыўся дзярж. пераварот, у час якога пад удар трапілі дэмакр. арг-цыі і прагрэс. дзеячы. У 1954 іранскі ўрад падпісаў пагадненне з т. зв. Міжнар. нафтавым кансорцыумам, што захавала залежнасць краіны ад імперыялістычных дзяржаў. У 1955 І. уступіў у Багдадскі пакт (гл. *Арганізацыя цэнтральнага дагавору*). З дапамогай кабальных пазык ЗША імкнуліся ўсталяваць свой кантроль над І., зрабіць яго антысавецкім плацдармам на Сярэднім Усходзе. У сак. 1959 падпісана амер.-іранскае ваен. пагадненне. Барацьба нар. мас супраць заняволення краіны амер. капіталам, супраць феад. перажыткаў і за дэмакр. свабоды актывізавалася ў 1960—61. Іранскі ўрад мусіў пайсці на некат. прагрэс. меры. 26.1.1963 праведзены ўсеагульны рэферэндум. Ён ухваліў агр. рэформу, нацыяналізацыю лясоў, змену закону аб выбарах, стварэнне «корпуса асветы» для барацьбы з непісьменнасцю. Засн. ў снеж.

Заняткі з дарослымі ў адной з сельскіх школ Ірана.



1963 партыя нац. буржуазіі Іране навін (Новы Іран) абвясціла сваёй праграмай эканам. развіццё і сац. прагрэс, ажыццяўленне агр. рэформы, павелічэнне зарплаты, умацаванне нац. незалежнасці краіны і г. д. Палепшыліся адносіны з СССР. У 1963 і 1966 падпісаны сав.-іранскія пагадненні пра эканам. і тэхн., у жн. 1966 пра культ. супрацоўніцтва. І. умацоўвае сувязі з сацыяліст. краінамі, падтрымлівае патрабаванне аб вывадзе ізраільскіх войск з арабскіх тэрыторый, акупаваных у выніку агрэсіі 1967, выступае за мірнае вырашэнне в'етнамскай праблемы на аснове Жэнеўскіх пагадненняў 1954. Захоўвае абавязацельствы ў межах СЕНТО. Чл. ААН з 1945.

Палітычныя партыі, прафсаюзы і іншыя грамадскія арганізацыі. Іране навін (Новы Іран). Створана ў 1963. Урадавая партыя. Мардом (Народ). Засн. ў 1957. Партыя паніраністаў. Засн. ў 1941, нацыяналістычная. Меліюн (Нац. партыя). Засн. ў 1958, да 1960 урадавая. Народная партыя Ірана. Засн. ў 1941. Партыя працоўных, пераемніца ІКП, у 1949 абвешчана па-за законам, працуе ў падполлі. Дзейнічаюць створаныя па ініцыятыве і з удзелам урада прафсаюзы. Таварыства культурных сувязей з СССР. Засн. ў 1943.

Гаспадарка. І.— аграрна-прамысл. краіна. У гаспадарцы занята 7,1 млн. чал., з іх у прамысловасці і буд-ве 27%. Прамысловасць дае 43,1% валавога нац. прадукту. З 1968/69 выконваецца 4-я пяцігадовая праграма развіцця эканомікі краіны. Асобнае месца ў прамысловасці належыць здабычы і перапрацоўцы нафты. Разведаныя запасы яе — 7,5 млрд. *т* (1969). У 1970 здабыта 191,4 млн. *т* (2-е месца ў капіталіст. свеце; перадгор'і Загроса і Эльбурса, в-аў Харк), каля 92% здабыта Міжнар. нафтавым кансорцыумам, у які ўваходзяць кампаніі ЗША, Вялікабрытаніі, Нідэрландаў, Францыі. Нафтаперапр. з-ды ў Абадане, Тэгеране, Месджэдэ-Салеймане, Керманшаху і Нефтшаху. Здабываюць (1968)





Абадан. Нафтаперапрацоўчы завод (злева). Прыкаспійская нізіна. Апрацоўка рысавага поля.

кам. вугаль (295 тыс. *т*, Пн і ПнЗ краіны), руды каляровых металаў (пераважна ідуць на экспарт), серу, соль, плавіковы шпат, азбест, карунд, тальк, слюду, у Туркмена-Харасанскіх гарах — бірузу. У 1968 здабыта 1572 млн. $м^3$ прыроднага газу (перадгор'і Загроса). Выпрацавана 4,3 млрд. *кват·гадз* эл. энергіі (1969), амаль палову даюць ГЭС. Сярод галін лёгкай прамысловасці найб. развіта тэкстыльная (баваўняная, шарсцяная, джутавая) і харчовая. Вытворчасць баваўняных тканін (450 млн. *м*, 1969) сканцэнтравана пераважна ў Тэгеранскім, Ісфаханскім і Мазендэранскім раёнах. Гал. цэнтр па вытворчасці шарсцяных тканін — Ісфахан. Джутавая прамысловасць у гарадах Шахі і Рэшт, шаўкаткацкая — Чалус і Тэгеран. Развіта саматужная вытворчасць дываноў (4 млн. *м*, 1969), вырабаў з медзі, серабра, бірузы. З галін харч. прамысловасці найб. развіта цукровая, рысаачышчальная і мукамольная. За 50 *км* ад Ісфахана будуецца (1972) з дапамогаю СССР металург. камбінат, пабудаваны гідратэхн. комплекс на р. Аракс, ЦЭЦ у Тэбрызе. Працуюць кансервавыя з-ды, чайныя і тытунёвыя ф-кі. У Тэгеране трубаліцейны з-д, у Ахвазе — сталепракатны і трубны, у Ганабадзе — медзеплавільны. Рамонтна-мех. майстэрні і ваен. з-ды ў Тэгеране і Тэбрызе, каля Керэджа працуе аўтаборачны з-д, у Тэбрызе трактарны, у Шыразе, Мешхедзе, Тэгеране і Дарудзе цэментавыя з-ды (2 млн. *т*, 1968—69). Вытворчасць фасфатных угнаенняў, соды, арган. фарбаў, лакаў, гумавых вырабаў. У с. гасп., якая дае 21,3% валавога нац. прадукту, занята 43% самадзейнага насельніцтва. Характэрны феад. перажыткі, якія затрымліваюць развіццё прадукцыйных сіл. Каб паскорыць развіццё капіталіст. адносін, з 1962 праводзіцца агр. рэформа. Пад пасевамі 8 млн. *га*, пераважаюць пшаніца (60% пасеваў), ячмень, рыс. Збор (тыс. *т*, 1969) і раёны пасеваў галоўных с.-г. культур: пшаніцы 4200 і ячменю 1100 (пасевы па ўсёй краіне); рысу 1395 (каспійскае ўзбярэжжа, цэнтр. і паўд. частка краіны), цукр. буракоў 3500. Вырошчваюць таксама кукурузу, проса, авёс, цукр. трыснёг, баваўнік, кенаф, тытунь, опіумны мак, чай, кунжут, клешчавіну. Садоўніцтва і вінаградарства. Жывёлагадоўля пашавага характару, экстэнсіўная. У 1970 было (млн. галоў): буйн. раг. жывёлы 6,4, авечак 32,0, коз 15, коней і мулаў 0,7, аслоў 2,2. Развіта шаўкаводства і рыбалоўства, здабываюць каралы і жэмчуг. Даўж. чыгунак каля 4,5 тыс. *км*. Шашэйных дарог з цвёрдым пакрыццём каля 40 тыс. *км*. Марскія перавозкі на замежных суднах. Гал. порты: Харэмшэхр, Бушыр, Бендэр-Абас, Пехлеві, Бендэр-Шах. Авіяпорты ў Тэгеране, Керманшаху, Тэбрызе, Ісфахане, Мешхедзе і Шыразе. Значная сетка трубаправодаў. Дзейнічае Трансіранскі газаправод, пабудаваны з дапамогай СССР. Экспарт (18,5 млрд. рыялаў, без нафты, 1969/70): баваўна, дываны, скуры, кішкі, металаруды, газ, ікра, садавіна; імпарт (115,5 млрд. рыялаў): машыны, абсталяванне, чорныя металы, хімікаты, медыкаменты, аўтамаб. шыны і камеры, шкло. Гандл. партнёры: ЗША, ФРГ, СССР, Японія, Вялікабрытанія. Грашовая адзінка — рыял.

Ісфахан. У дывановай майстэрні.



Узброеныя сілы І. складаюцца з сухапутных войск, ВПС і ВМС. Агульная колькасць (1970) каля 221 тыс. чал. Акрамя таго, ёсць жандармерыя і таможныя войскі (усяго каля 24 тыс. чал.). Вярх. галоўнакамандуючы — шах. Вышэйшае ваен. кіраўніцтва ажыццяўляюць ваен. міністр і штаб вярх. галоўнакамандуючага. Сухапутныя войскі (каля 200 тыс. чал.) маюць 7 дывізій, 5 асобных брыгад, больш за 15 асобных батальёнаў і дывізіёнаў. Узбраенне пераважна амер. вытворчасці. ВПС (каля 15 тыс. чал.) складаюцца з 14 авіяц. эскадрылляў (180 баявых самалётаў, пераважна амер. вытворчасці). ВМС (каля 6 тыс. чал.) маюць 6 вартавых караблёў, процілодачныя і інш. катэры і дапаможныя судны.

Ахова здароўя. Сістэма аховы здароўя складаецца з дзярж., прыватнай, дабрачыннай і інш. У 1966 было 398 бальніц на 28,3 тыс. ложкаў (0,8 на 1 тыс. ж.), у 1966 працавала 11 626 урачоў (1 на 2200 ж.), 70% з якіх у Тэгеране і інш. вял. гарадах, 4532 чал. сярэдняга мед. персаналу. Паліклінічная дапамога пераважна прыватная. Рыхтуюць урачоў на 7 мед. ф-тах ун-таў. Нараджальнасць (1967) 40,1 на 1 тыс. ж.; дзіцячая смяротнасць 95,3

на 1 тыс. жыванароджаных. З хвароб найб. пашыраны туберкулёз, малярыя, трахома, брушны тыф, дызентэрыя, дзіцячыя інфекцыі, бываюць натуральная воспа, халера, чума.

Асвета, навуковыя ўстановы. У 1927 ажыццёўлена школьная рэформа, накіраваная на стварэнне дзярж. і свецкіх школ, прыняты закон аб усеагульным абавязковым пач. навучанні. Рэформа садзейнічала развіццю асветы ў І. Дзіцячыя сады для дзяцей 3—6 гадоў, у большасці прыватныя. Пач. школа 6-гадовая, навучанне з 7 гадоў, раздзельнае. У 1967/68 навуч. г. ў пач. школах займалася 2575,6 тыс. вучняў. Сярэдняя школа 6-гадовая, мае 2 ступені (па 3 гады). У 1967/68 навуч. г. ў сярэдніх школах навучалася 673,7 тыс. чал. Прафесійныя школы 6-гадовыя і 3-гадовыя с.-г. на базе пач. школы. Вышэйшую адукацыю даюць ун-ты і спец. ВНУ. Ун-ты: Тэгеранскі, у Тэбрызе, Мешхедзе, Шыразе, Ахвазе. Нац. б-ка ў Тэгеране. Музеі: этнаграфічны і археалагічны ў Тэгеране. У І. Іранская акадэмія, Брытанскі ін-т перс. навучання, Французскі ін-т Тэгерана, ін-т Пастэра, ін-т Тэгерана, эканам. даследчы ін-т, ін-т гідранавук і тэхналогіі водных рэсурсаў, ін-т даследавання нар. здароўя, Іранскі ін-т нафты, ін-т італьян. культуры, Дзярж. фармацэўтычны ін-т, Дзярж. ін-т Разі, НДІ шкоднікаў і хвароб раслін і інш.

Друк, радыё, тэлебачанне. У І. выдаецца 210 газет і часопісаў (на 1970). 163 належаць прыватным выдаўцам, астатнія — урадавыя. Найбольш папулярныя газеты: «Аяндэган» («Будучыя»), мае сувязь з урадавымі і афіц. коламі; «Бурс» («Біржа») — гандл.-эканамічная; «Недае Іране навін» («Голас новага Ірана») — орган партыі Іране навін; «Кейхан» («Сусвет») — сталічная газета, належыць выдавецтву, якое ўзначальвае сенатар Месбах-задэ; «Мардом» («Народ») — орган Нар. партыі; «Седае мардом» («Голас народа») — ліберальнага кірунку; «Tehran Journal» («Тэгеранская газета», на англ. мове), «Этэлаат» («Паведамленні») — выдавецтва «Этэлаат» на чале з сенатарам Абасам Масудзі. Часопісы «Сепід ва сіях» («Белае і чорнае»), «Ханданіха» («Чытанне») — памяркоўна-ліберальнага кірунку; «Тэхране масавар» («Ілюстраваны Тэгеран»), «Этэлаатэ хафтэгі» («Штотыднёвыя паведамленні») — паліт., крайне правыя. Матэрыялы прэса атрымлівае ад урадавага інфармацыйнага агенцтва Парс. Працуюць: урадавая радыёслужба «Радыё Ірана», дзярж. тэлевізійная служба «Нац. іранскае тэлебачанне», прыватная тэлевізійная камерцыйная кампанія «Тэлебачанне Ірана».

Літаратура. Літаратура І. (саманазва — персідская л-ра) — адна з найб. старажытных л-р свету. Адгалоскі міфалогіі і гераічнага эпасу зберагліся ў свяшчэннай кн. зараастрызму «Авесце», клінапісных стараж.-перс. надпісах Ахеменідаў. З пехлевійскай л-ры (3—7 ст.) дайшлі кн. «Асірыйскае дрэва», «Памятка Зарэрава сына», «Справы Ардашыра Папакана», кампілятыўныя зборы кананізаванага зараастрызму «Бундахішн», «Дэнкард». Пасля араб. заваявання (7 ст.) л-ра І. існавала на араб. мове, на якую перакладаліся і помнікі пехлевійскай л-ры, у т. л. «Каліла і Дымна». Л-ра на фарсі, якая ўзнікла ў 9 ст., расквітнела ў 10 ст. (паэты *Рудакі*, *Фірдаўсі*). У той час склаліся дыдакт. жанр («Афарын-намэ» Абу Шакура Балхі) і жанр маст. прозы («Сіндбад-намэ» Абу-ль-Фаварыса Канарызі). У 11 — пач. 13 ст. ў паэзіі развіваліся «малыя жанры» (рубаі і газелі); у прыдворнай паэзіі зарадзіўся ўскладнёны рытарычны, т. зв. іракскі стыль. Прыдворная панегірычная паэзія (касыда) даведзена да дасканаласці ў творчасці Энверы і Хакані. Гуманіст. традыцыі прадоўжаны ў творчасці Масуда Сада Сальмана (заснавальніка жанру «турэмнай элегіі»), Адыба Сабіра з Тэрмеза, вучонага-матэматыка *Умара Хаяма*. Вяршыня гуманіст. плыні — паэзія *Нізамі*. Проза 12 ст. ўласцівы рытарычны стыль («Макамат-і Хамідзі» Хамідадына Балхі). У 13—15 ст. развівалася філас.-містычная, т. зв. суфійская паэзія (Джалаледын Румі), аформілася апазіцыйна-гуманіст. плынь (сатырык Убейда Закані, майстар філас. мініяцюры — кыт'а — Ібн Ямін, паэты Саадзі і Хафіз). Выдатны прадстаўнік паэзіі 15 ст.— *Джамі*. Пасля 15 ст. ў л-ры на фарсі адбываецца працэс дэзінтэграцыі: адасобіліся таджыкская л-ра; цюркамоўныя народы (азербайджанцы, узбекі, туркі і інш.), якія раней пісалі пераважна на фарсі, пачалі ствараць л-ру на роднай мове. У ідэйна-маст. плане паэзія І. на фарсі зрабілася ў многім эпігонскай, жанравы дыяпазон яе звузіўся. Асн. жанры — касыда і газель — з найб. сілай перадавалі духоўны свет паэта (Газалі Мешхедзі, Арфі Шыразі, Вахшы Іездзі). У 18 ст. ў прыдворнай паэзіі ўтварылася плынь «базгашт» («вяртанне»), прадстаўнікі якой імкнуліся адрадзіць стыль ранніх іран. класікаў. У 19 ст. Абу Наср Фатхалахан Шэйбані стварыў вершы, поўныя нездаволенасці жыццём і эпохай; у іх выявілася рэаліст. тэндэнцыя, развіццё якой прывяло да ўсталявання крытычнага рэалізму. У канцы 19 ст. паявіўся новы кірунак — асветніцтва. У час іран. антыфеад. рэвалюцыі 1905—11 паэзія напоўнілася сац. і дэмакр. матывамі. Упершыню ў л-ры І. ўзнікла паліт. сатыра (Алі Акбар Дэхоў, Малек ош-шаара Бехар, Мірзадэ Эшкі і інш.). Паэт Німа Юшыдж выступіў наватарам вершаскладання. Абнаўлялі вершаваную форму таксама паэты 50—60-х г. (Афрашта, Табары). Паэты Жале Сальтані, Сае і інш. ў рэаліст. творах адлюстравалі сац.-паліт. канфлікты. З антыімперыяліст. вершамі выступілі Ферыдун Тавалалі, Шэранг, Абу Тараб Джалі і інш., але пасля задушэння ў 1953 дэмакр. руху многія адышлі ад барацьбы, здрадзілі колішнім ідэалам. У творчасці маладых паэтаў загучалі песіміст. матывы (Сімінбар Бехбахані, Хасан Ханармандзі), паявілася абстрактная філас. лірыка (Надэр Надэрпур, Лабат Шэйбані); у іх вершах праз змрочна-трагічны роздум выразна загучалі грамадз. матывы. Традыц. паэзію прадаўжалі Махамед Хасейн Шахрыяр, Парвіз Натэль Ханлары, Мехдзі Хамідзі, Рахі Мааеры. У прозе з пач. 20 ст. пашырыўся гістар. раман (Махамед Багер Хасраві, Шэйх Муса Натары, Рахімзадэ Сафаві, Пурэ Кашані і інш.), напісаны ва ўмоўнай схемат. форме. Адначасова паявіліся сац. раманы з пэўнымі натураліст. тэндэнцыямі; асн. іх тэма — трагедыя бяспраўнай жанчыны (Мартэз Машфег Каземі, Ях'я Даўлатабадзі, Абас Халілі, Махамед Хеджазі). Шырокая сац.-бытавая тэма прыходзіць у 20-я г. з жанрам навелы, пачынальнік якой Сеід Махамед Алі Джамалзадэ. Рэалізм, які ўзнік на пач. 20 ст., расквітнеў у творчасці Садэга Хедаята. Сцвярджэнню крыт. кірунку спрыяў таксама Базорг Алеві. Крайні песімізм, безвыходнасць, дэградацыя асобы — асн. рысы аповесцей Махамеда Масуда Дэхаці. Рэаліст. апавяданні на сучасныя тэмы ў 50—60-я г. стваралі Саід Нафісі, Абулгасем Халат, Садэг Чубек, Бехазін, Джалал ал-Ахмад і інш.

Архітэктура, выяўленчае мастацтва. Стараж. гліняныя і сырцовыя жытлы І. адносяцца да 5—4-га тысячагоддзяў да н. э. (Тэпе-Сіялк). Ад часоў Элама дайшлі зікураты, ад 10—6 ст.— скальныя пахавальні з двухстаўповай фасаднай нішай. Пры Ахеменідах у гарадах Пасаргады, Персепаль, Сузы будаваліся манумент. палацы з шматстаўповымі заламі (ападанамі), высокія калоны якіх увенчваліся складанымі капітэлямі. Палацы аздабляліся каменнымі рэльефамі. Скляпеністыя залы (айваны) у палацах Сасанідаў дапаўняліся купальнымі заламі (Фірузабад, Сервестан), купаламі накрываліся квадратныя ў плане свяцілішчы агню. Пасля 7 ст. н. э. паяўляюцца мячэці з шматкалоннымі скляпеністымі галерэямі вакол двара, у 11—14 ст. будуюцца вежавыя маўзалеі (вежавы рабрысты маўзалей у Гамбедэ-Кабусе), культавыя ансамблі, караван-сараі, масты. Цагляная муроўка аздабляецца паліваю. Вял. ўздым архітэктуры 16—17 ст. пры Сефевідах выявіўся ў горадабудаўніцтве, асабліва ў абнаўленні г. Ісфахан. Найб. значныя помнікі сярэднявечча — Саборная мячэць у Ісфахане, 8-гранны маўзалей Альджэйту-Хадабендэ ў Сальтаніе, мячэць Гаўхар-шад у Мешхедзе і інш. Прыкладное мастацтва развівалася з неаліту: выраблялася роспісная кераміка з геам. арнаментам і сілуэтамі звяроў. Бронзавыя прадметы з могільнікаў Лурыстана (12—8 ст. да н. э.) аздоблены выявамі фантаст. істот. Зберагліся ахеменідскія і сасанідскія блюды, чашы, рытоны з золата і серабра. Сярэдневяковыя майстры ўпрыгожвалі бронзавы посуд чаканкай і інкрустацыяй, распісвалі паліваную кераміку, выраблялі рознакаляровае шкло, узорыстыя шаўковыя тканіны. Асаблівым майстэрствам, багаццем фарбаў вызначаюцца вырабы ткачоў пры Сефевідах — тафта, аксаміт, ворсавыя дываны, габелены. Выяўл. мастацтва Ст. І. найбольш вядома скальнымі рэльефамі, з часоў Сасанідаў іх зберaглося больш за 30. Палацы ўпрыгожваліся жывапісам і мазаікай. У сярэднія вякі высокага ўзроўню дасягнула мастацтва мініяцюры (Тэбрызская, Шыразская, Ісфаханская школы), найб. значныя майстры 17 ст.— партрэтысты Рэза Абасі, Ага Рэза. Заснавальнікам сучаснага рэаліст. жывапісу на мяжы 20 ст. быў Кемаль-оль-Мольк. Пад уплывам зах. мастацтва ў І. значна развіліся мадэрнісцкія плыні (мастакі М. Мамаез, Б. Садр, М. Вазіры). У рэаліст. традыцыях працуюць жывапісцы Дж. Зіяпур, А. Амеры, скульптар А. Аржанг і інш. Сучасная архітэктура І. вырашае горадабудаўнічыя задачы, ідзе частковая рэканструкцыя старых гарадоў, але ўзровень добраўпарадкавання ў іх пераважна нізкі. Будуюцца плаціны, масты, па прынцыпах сучаснай архітэктуры ствараюцца грамадскія будынкі (Сенат у Тэгеране, атэлі, бальніцы). Сярод архітэктараў — М. Фараўгі, Х. Гіяі, Х. Сейхун. Іл. гл. на ўкл.

Музыка. Асновы персідскай муз. сістэмы склаліся ў эпоху Сасанідаў (3—7 ст.). З даўніх часоў існавалі ваен. аркестры з нац. інструментаў (карна, сурна, накара). У сярэднявечча развіваецца прыдворнае мастацтва, асн. формы якога — оды (касыды) і лірыч. песні (газелі). Набываюць папулярнасць у народзе спевакі-танцоры мутрыбы. Прафес. і нар. музыка І. пераважна аднагалосая, кампазітары-выканаўцы выкарыстоўваюць своеасаблівыя меладычныя схемы — дастга. З 2-й чвэрці 19 ст. ў музыцы І. адчуваецца еўрап. ўплыў. Істотныя змены ў муз. жыцці адбываюцца толькі пасля 2-й сусв. вайны. Арганізаваны першыя муз. школы. У Тэгеране працуюць сімф. аркестр і хор, з 1967 наладжваюцца муз. фестывалі ў Шыразе. Сярод сучасных музыкантаў: кампазітары Абуль Хасан Себа, З. Асланян, Вазіры, Ш. Кахнін, спявачкі Ф. Себа і Ф. Панах, піяністка Т. Ашот-Аруцюнянц.

Тэатр. У Ст. І. існавала мастацтва пантамімы і т-р лялек (ценявы і марыянетак). З нар. містэрый абраду «шахсейвахсей» узнік рэліг. т-р тазіе. У 1890 адкрыты т-р для знаці. У 1-й чвэрці 20 ст. дзейнічалі прафес. трупы («Іранская камедыя» і інш.). У час праўлення Рэза-шаха нар. мастацтва праследавалася, пераймаўся еўрап. т-р. Вядомы тэатр. дзеяч А. Нушын. У 60-я г. ў прыватных т-рах Тэгерана, Мешхеда, Ісфахана, Хамадана ставіцца пераважна перакладная драматургія.

Літ.: Маркс К. Англо-персидская война.— Договор с Персией.— Война против Персии, Маркс К. и Энгельс Ф. Соч., т. 12; Энгельс Ф. Перспективы англо-персидской войны.— Персия и Китай, там жа; Ленін У. І. Гаручы матэрыял у сусветнай палітыцы.— Падзеі на Балканах і ў Персіі, Тв., т. 15 (Полн. собр. соч., т. 17); яго ж. Аб нападзе рускага ўрада на Персію [VI «Пражская» ўсерасійская канферэнцыя РСДРП. 5—17(18—30) студзеня 1912 г.], Тв., т. 17 (там жа, т. 21); яго ж. Даклад аб дзейнасці Савета Народных Камісараў 22 снежня [VIII Усерасійскі з'езд Саветаў 22—29 снежня 1920], Тв., т. 31 (там жа, т. 42); Абдуллаев З. З. Промышленность и зарождение рабочего класса Ирана в конце XIX — начале XX вв., Баку, 1963; яго ж. Начало экспансии США в Иране, М., 1963; Грантовский Э. А. Ранняя история иранских племен Передней Азии, М., 1970; Глуходед В. С. Проблемы экономического развития Ирана (20-е—30-е годы), М., 1968; Дьяконов М. М. Очерк истории древнего Ирана, М., 1961; Иванов М. С. Новейшая история Ирана, М., 1965; яго ж. Иран сегодня, М., 1969; Мирошников Л. И. Английская экспансия в Иране (1914—1920), М., 1961; История Ирана с древнейших времен до конца XVIII века, Л., 1958; Алексеев Л. Советский Союз и Иран, М., 1963; Агаев С. Л. Иран в период политического кризиса 1920—1925 гг., М., 1970; Победина М. П., Смирнов В. П. и Цыбульский В. В. Экономическая география стран Ближнего и Среднего Востока, М., 1969; Бертельс Е. Э. Избр. труды, [т. 1] — История персидо-таджикской литературы, М., 1960; Брагинский И. С. 12 миниатюр, М., 1966; Брагинский И. С. и Комиссаров Д. С. Персидская литература, М., 1963; Комиссаров Д. С. Очерки современной персидской прозы, М., 1960; Кляшторина В. Б. Современная персидская поэзия, М., 1962; Занд М. И. Шесть веков славы, М., 1964; Короглы Х. Современная персидская литература, М., 1965; История персидской и таджикской литературы, пер. с чеш., М., 1970; Всеобщая история искусств, т. 1—2 (кн. 1), М., 1956—60; Всеобщая история архитектуры, т. 1, 8, М., 1969—70; Беляев В. Персидские теснифы, М., 1964; Сверчевская А. К. (сост.). Библиография Ирана, М., 1967.

В. Р. Заўрыеў (прырода), *М. С. Вайтовіч* (гаспадарка), *Р. М. Трухноў* (гістар. нарыс). Мінск; *З. К. Навокіна* (асвета), *Х. Г. Кораглы* (літаратура), *В. Л. Вароніна* (архітэктура, выяўл. мастацтва). Масква.

ІРАНІСТЫКА, сукупнасць навук, якія вывучаюць гісторыю, эканоміку, мову і літаратуру, матэрыяльную і духоўную культуру народаў Ірана (у шырокім значэнні слова — усіх іранамоўных народаў).

Як навука І. канчаткова склалася ў сярэдзіне 19 ст. У Расіі першыя звесткі пра Іран з'явіліся з часу падарожжа Афанасія *Нікіціна* (15 ст.). Першыя навук. працы адносяцца да канца 18 ст. Колькасць работ па І. павялічылася ў 19 ст. ў сувязі з актывізацыяй палітыкі царскай Расіі ў Іране. Сац.-эканам. пытанні гісторыі Ірана і прылеглых краін упершыню пачаў распрацоўваць В. У. *Бартальд*. Якасна новы этап развіцця І. пачаўся пасля Вял. Кастр. сацыяліст. рэвалюцыі. Сав. іраністы асаблівую ўвагу аддаюць вывучэнню нац.-вызв. барацьбы народаў Ірана супраць імперыялізму. Гал. цэнтры І. ў СССР: Ін-т усходазнаўства АН СССР (Масква), Ін-т усх. моў пры Маск. дзярж. ун-це, Ленінград, Ашхабад, Баку, Душанбе, Ерэван, Ташкент, Тбілісі.

ІРАНСКАЕ НАГОР'Е, у Пярэдняй Азіі, пераважна ў межах Ірана, Афганістана і Пакістана. Пл. каля 2,7 млн. *км²*. Працягласць з З на У 2500 *км*, з Пн на Пд да 1500 *км*.

З усіх бакоў акаймавана гарамі, выш. 2000—4000 *м*: Эльбурс (найвыш. пункт г. Дэмавенд, 5604 *м*), хр. Капетдаг, Парапаміз, Гіндукуш, Загрос, Цэнтр. Макранскі хр., Сулейманавы горы. Ва ўнутр. нагор'і горныя хрыбты чаргуюцца з катлавінамі, занятымі пустынямі Дэштэ-Лут, Дэштэ-Кевір і інш., якія ляжаць на выш. 500—2000 *м*. І. н. багата на нафту, жал. і медную руды, поліметалы, азбест, графіт, серу, каштоўныя і рэдкія металы. Клімат на б. ч. тэрыторыі сухі субтра-



Люстравы збан. 14 ст. (злева). Бахрам Гур і Азадэ. Мініяцюра з рукапісу «Шахнамэ» Фірдаўсі. Каля 1425. Бадлеянская бібліятэка. Оксфард.

пічны, кантынентальны. Найб. рэкі: Гільменд, Сефідруд, Карун, Герыруд. Расліннасць пустынная і паўпустынная, у аазісах на Пд фінікавая пальма.

ІРА́НСКІ АЗЕРБАЙДЖА́Н, вобласць на паўн. захадзе Ірана. І. А. з 1928 называюць паўд. частку Азербайджана, якая асталася ў межах Ірана пасля руска-персідскай вайны 1826—28 (гл. *Руска-іранскія войны*). Адзін з цэнтраў нац.-вызваленчага і дэмакр. руху 20 ст. ў Іране (паўстанні 1908—09 і 1920 у г. Тэбрызе, паўстанні салдатаў і жандараў у 1922 і 1926, шырокі дэмакр. рух 1945—46).

ІРА́НСКІЯ МО́ВЫ, група сваяцкіх моў індаеўрапейскай сям'і, найболей блізкая да *індыйскіх моў*. Пашыраны ў Іране, Афганістане, Сярэдняй Азіі, часткова на Каўказе, у Турцыі, Пакістане. Найб. усталяваны падзел на ўсх. і зах. групы не зусім адпавядае сучасн. геагр. размяшчэнню І. м. Усх. група ўключае асецінскую, афганскую, памірскія, ягнобскую, а зах.— персідскую, таджыкскую, курдскую, белуджскую і прыкаспійскія мовы. У СССР пашыраны таджыкская, асецінская, памірскія, ягнобская, прыкаспійскія (талышская, тацкая), часткова курдская і белуджская мовы. На І. м. гаворыць болей за 40 млн. чал., у т. л. ў СССР болей за 2,6 млн. чал.

Старажытныя І. м.— старажытнаперсідская (клінапісныя надпісы 6—4 ст. да н. э.); мова «Авесты» — свяшчэннай кнігі зараастрызму, створанай у пач. 1-га тысячагоддзя да н. э., запісанай значна пазней (3 ст. да н. э.), да нас дайшлі копіі яшчэ больш позняя (13—14 ст. н. э.); скіфская (сакская), ад якой зберагліся толькі паасобныя словы і ўласныя імёны. Мёртвыя І. м. сярэдняга перыяду (1-е тысячагоддзе н. э.) — сярэднеперсідская, парфянская, сагдыйская, харэзмійская і інш. У наш час новымі літаратурнымі І. м. з'яўляюцца персідская, таджыкская, курдская, афганская, асецінская, белуджская (у Пакістане). Старажытным І. м. характэрныя развіты сінт. лад, флектыўны тып марфалогіі з разгорнутай сістэмай імя і дзеяслова; гэтыя рысы ў сучасных І. м. значна спрасціліся: страчана катэгорыя роду, скарацілася колькасць склонаў, пашырыліся аналітычныя рысы. Асаблівасць сінтаксісу — наяўнасць ізафетнай канструкцыі са спец. марфалагічным абазначэннем таго слова, да якога адносіцца атрыбут.

Літ.: Оранский И. М. Иранские языки, М., 1963; Расторгуева В. С. Иранские языки, у кн.: Советское языкознание за 50 лет, М., 1967 (бібліягр.); Языки народов СССР, т. 1, М., 1966.

А. Я. Супрун. Мінск.

ІРА́СЕК (Jirásek) Алаіс (23.8.1851, г. Гронаў — 12.3.1930), чэшскі пісьменнік. Вучыўся на філас. ф-це Пражскага ун-та (1871—74). Друкавацца пачаў у 1871. Рэалістычна адлюстраваў рэвалюц.-дэмакр. гусіцкі рух (раманы-хронікі «Паміж плынямі», 1887—90; «Супраць усіх», 1894; «Братэрства», т. 1—3, 1898—1908; драмы «Ян Жыжка», 1903; «Ян Гус», 1911; «Ян Рогач», 1914), антыфеад. сялянскія паўстанні (зб. «Горныя апавяданні», 1878; раманы «Скалакі», 1875; «Пры герцагскім двары», 1881; «Псагалоўцы», 1884), уздым чэш. нац.-вызв. руху (раманы «Ф. Л. Век», т. 1—5, 1891—1907; «У нас», т. 1—4, 1897—1904; і інш.). З імем І. звязаны росквіт чэш. гістар. рамана. Узнімаючыся да рэаліст. разумення гістар. працэсу, І. паказаў народ гал. дзейнай яго сілай. Аповесць «Собата» прасякнута сімпатыяй да паўстання 1863. Аўтар кн. «Старыя чэшскія паданні» (1894).



Тв.: Рус. пер.— Соч., т. 1—8, М., 1955—58.

Літ.: Алоис Ирасек. Биобиблиогр. указатель, М., 1955.

ІРАЦЫЯНАЛІЗМ (лац. irrationalis неразумны), філасофскі погляд, які абмяжоўвае магчымасці рацыян. пазнання і проціпастаўляе яму сузіранне, *інтуіцыю*, інстынкт і інш.

Дыскрэдытуючы розум, інтэлект, І. абгрунтоўвае неінтэлектуальны шлях пранікнення ў сутнасць быцця, выступае за культ пачуццяў: разважанню проціпастаўляе моц перажыванняў першабытных жыццёвых сіл, «штучнаму інтэлекту» — «здаровы інстынкт». І.— рэакцыя на веру ў сілу розуму і яго бязмежныя магчымасці. Сучасны І. узнік пасля таго, як былі абвергнуты міфалагічныя і рэліг. формы свядомасці. Песімістычна ставіцца да навук.-тэхн. дасягненняў, абвінавачвае розум у ваганах бурж. цывілізацыі. Прадстаўнікі І.— А. Шапенгаўэр, Ф. Ніцшэ, А. Бергсон, У. Джэмс, Э. Гусерль і інш.

Літ.: Асеев Ю. А. и Кон И. С. Основные направления буржуазной философии и социологии XX века, Л., 1961; Богомолов А. С. Идея развития в буржуазной философии XIX и XX веков, М., 1962; Хилл Т. И. Современные теории познания, пер. с англ., М., 1965.

П. Ф. Пратасеня. Мінск.

ІРАЦЫЯНА́ЛЬНЫ І РАЦЫЯНА́ЛЬНЫ ВЫРАЗЫ, алгебраічныя выразы, якія адрозніваюцца паводле прынцыпу наяўнасці або адсутнасці *радыкала*. Напр., $\sqrt{x+y}$ і $\sqrt[3]{a+b^2}$ — ірацыянальныя выразы, а $a+b^2$ і $\frac{x}{y-z}$ — рацыянальныя выразы.

ІРАЦЫЯНА́ЛЬНЫЯ ЎРАЎНЕ́ННІ, ураўненні, якія змяшчаюць невядомую велічыню пад знакам *радыкала*. Напр., $\sqrt{x-2}=5$.

ІРБІС, драпежная млекакормячая жывёла. Гл. *Барс*.

ІРВЯНІЦА, вёска ў Баеўскім с/с Дубровенскага р-на Віцебскай вобл., каля р. Мярэя (1 *км*). Цэнтр калгаса «Кастрычнік». За 26 *км* на ПдУ ад Дуброўна, 133 *км* ад Віцебска, 36 *км* ад чыг. ст. Асінаўка, аўтамаб. дарогай злучана з Дуброўна. 232 ж., гасп. 65 (1971). Сепаратарны пункт. Пач. школа, клуб, б-ка, вет. пункт, магазін. У 1943 ням.-фаш. захопнікі спалілі вёску. Помнік воінам-землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ІРГА́ (Amelanchier), род раслін сям. ружакветных. Вядома 25 відаў, пашыраных у Паўн. паўшар'і. У СССР 10 відаў. На Беларусі дзіка не расце; у Цэнтр. Бат. садзе АН БССР інтрадукавана 8 відаў.



Ірга круглалістая: *1* — галінка з лісцем і суквеццем; *2* — галінка з пладамі.

Кусты, радзей дрэўцы, выш. да 3 *м*. Лісце цэласнакрайняе або зубчастае. Кветкі белыя, адзіночныя ці ў гронках. Плады — сакаўныя сінявата- або пурпурова-чорныя. На Беларусі ў дэкар. садоўніцтве найб. пашыраныя І. канадская (A. canadensis), І. каласістая (A. spicata), І. круглалістая (A. rotundifolia). Плады ядомыя, салодкія (маюць да 10% цукру), багатыя на вітаміны А і С. Ірга выкарыстоўваецца на прышчэпу для карлікавай культуры грушы. Кара і лісце ўжываюцца ў медыцыне.

Літ.: Деревья и кустарники, розы и сирень, Мн., 1968; Рыбицкий Н. А. и Гаврилов И. С. Дикорастущие плоды и ягоды, Л., 1969.

ІРГЕР Юлій Маркавіч [23.5 (4.6).1897, Мінск — 26.5.1941], беларускі савецкі вучоны ў галіне хірургіі. Д-р мед. н. (1928), праф. (1934). Засл. дз. нав. БССР (1939). Скончыў Маскоўскі ун-т (1922). У 1922—30 у БДУ. У 1934—37 заг. кафедры аперацыйнай хірургіі і тапаграфічнай анатоміі, у 1937—41 кафедры шпітальнай хірургіі Мінскага мед. ін-та. Навук. кіраўнік НДІ гематалогіі і пералівання крыві Наркамата аховы здароўя БССР (1932—41). Асн. працы па пытаннях агульнай, клінічнай і аперацыйнай хірургіі, уралогіі, анатоміі і пералівання крыві.

Тв.: Влияние перевязки семявыносящих протоков на простату и на яичко, «Труды Белорусского государственного университета», 1927, № 13; Новый способ проникновения к Гассерову узлу, «Вестник хирургии и пограничных областей», 1930, т. 21, кн. 61; Пасляаперацыйная і пасляродавая затрымка мачы, Мн., 1932.

ІРЖА́ РАСЛІН, хвароба культурных і дзікарослых раслін, якая выклікаецца ржаўнымі грыбамі.

І. р. развіваецца на лісці, сцяблах, каласах і інш. частках раслін, утвараючы ржава-чырвоны або цёмна-буры налёт спораў грыба (пустулы). Жыве за кошт пажыўных рэчываў раслін. Зерне робіцца шчуплае, памяншаецца стойкасць раслін да холаду і засухі, ураджай меншае часам на 15—20%. Пераносіцца І. р. спорамі грыба — узбуджальніка хваробы (базідыяльныя грыбы парадку Uredinales). Паразітуе на збожжавых культурах, кармавых злакавых травах, лёне, сланечніку, гаросе, фасолі, пладова-ягадных культурах і інш. Найб. пашыраны сцябловая лінейная і жоўтая ржа злакаў, бурая лісцевая ржа пшаніцы і жыта, карончатая ржа аўса, карлікавая ржа ячменю. Меры барацьбы: увядзенне ўстойлівых сартоў, правільнае чаргаванне культур у севазвароце, пасеў яравых у раннія тэрміны, азімых — у аптымальныя, падкормка фосфарна-калійнымі ўгнаеннямі, а таксама ўборка ў сціслыя тэрміны.

Літ.: Купревич В. Ф. и Траншель В. Г. Ржавчинные грибы, в. 1 — сем. Мелампсоровые, М.— Л., 1957 (Флора споровых растений СССР, т. 4); Дарожкін М. А. і Ярышко Л. У паход супроць іржаўчыны зерневых культур, Мн., 1934; Дарожкін М. А. Хваробы збожжа, некаторых бабовых культур і меры барацьбы з імі, 3 выд., Мн., 1935.

Г. В. Ягорава. Жодзіна.

ІРКУЦК, горад, цэнтр Іркуцкай вобл. РСФСР. Прамысл., навук. і культ. цэнтр Усх. Сібіры. Размешчаны на Ангары, пры ўпадзенні р. Іркут. Вузел аўтамаб. дарог, чыг. ст., прыстань, аэрапорт. 462 тыс. ж. (1971). Машынабудаванне (з-ды цяжкага машынабудавання, механічны), харчовая (мясны і мукамольны камбінаты, чаепрасавальная і кандытарская ф-кі), дрэваапр. і лёгкая (гарбарны з-д, футравая ф-ка) прамысловасць. Вытв. буд. матэрыялаў, апрацоўка слюды. Алюмініевы з-д (у прыгарадзе Шэліхаў). На Ангары Іркуцкая ГЭС (660 тыс. *квт*). У І. геафіз. абсерваторыя. *Іркуцкі універсітэт*, ін-ты: політэхнічны, с.-г., нар. гасп., мед., пед., пед. замежных моў. 24 сярэднія спец. навуч. ўстановы. 4 тэатры (драм., муз. камедыі, юнага гледача, лялечны). Краязнаўчы і мастацкі музеі.

У 1661—69 на месцы І. пабудаваны абарончыя ўмацаванні — астрог, у 1686 пераўтвораны ў горад. З 1764 цэнтр Іркуцкай губ., з 1803 рэзідэнцыя ген.-губернатара Сібіры. Пры царызме быў месцам паліт. ссылкі. Сав. ўлада ўстаноўлена 22.12.1917 (4.1.1918). У ліп. 1918 захоплены белагвардзейцамі. Сав. ўлада адноўлена 25.1.1920.

ІРКУЦКАЯ ВО́БЛАСЦЬ, у складзе РСФСР. Утворана 26.9.1937. Размешчана ў Усх. Сібіры на ПдУ Сярэднесібірскага пласкагор'я. Пл. 767,9 тыс. *км*². Нас. 2330 тыс. чал. (1971). Падзяляецца на 27 раёнаў; 20 гарадоў, 52 гар. пасёлкі. У складзе І. в. Усць-Ардынская Бурацкая нац. акруга. Цэнтр г. Іркуцк.



Паверхня І. в.— пласкагор'е, парэзанае глыбокімі рачнымі далінамі. Сярэдняя выш. 500 *м*. На Пд хрыбты Усх. Саяна (выш. да 2875 *м*) і Прыбайкалля. На ПнУ Паўночна-Байкальскае і Патамскае нагор'і выш. да 1720 *м*. Карысныя выкапні: вугаль, жал. руда, золата, слюда, тальк, магнезіт, графіт, спажыўная соль, буд. матэрыялы, нафта. Клімат рэзка кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. −33 (Бадайбо), −21 (Іркуцк), −16 °С (паўд.-зах. ўзбярэжжа Байкала); ліп. ад 17 да 19 °С. Ападкаў на пласкагор'і 300—400 *мм*, на паўн.-зах. і зах. схілах гор 600—800 *мм*. Вегет. перыяд 120—147 дзён. Ёсць участкі шматгадовай мерзлаты. Рэкі належаць да бас. Лены і Енісея; найб. Ангара (з прытокамі Іркут, Кітой, Белая, Ака і інш.), Ніжняя Тунгуска, Лена (з прытокам Віцім). У І. в. частка воз. Байкал з в-вам Альхон. Глебы пераважна падзолістыя, у лесастэпавых раёнах шэрыя лясныя і чарназёмы. Лесам укрыта больш за 70% тэр. У гарах вышынная пояснасць. Насельніцтва пераважна рускае, жывуць таксама бураты, эвенкі і інш. Сярэдняя шчыльн. 3 чал. на 1 *км*². Гарадскога нас. 73%. Найб. гарады: Іркуцк, Ангарск, Брацк, Чарамхова.

Асн. галіны прамысловасці — энергетыка і горназдабыўная. Найбольшыя ГЭС: Іркуцкая (660 тыс. *квт*), Брацкая (4,5 млн. *квт*), Мамаканская (86 тыс. *квт*); будуецца (1972) Усць-Ілімская (4,3 млн. *квт*). Здабыча вугалю ў Іркуцкім і Чарамхоўскім кам.-вуг. басейнах, золата ў бас. Лены і Віціма, слюды ў бас. Мамы і Чуі, жал. руды ў Каршуноўскім радовішчы, спажыўной солі каля Усолля-Сібірскага. Перапрацоўка слюды на Іркуцкай і Ніжнеудзінскай ф-ках. Здабыча тальку, гіпсу, кааліну, вапнякоў. У Жалезнагорску працуе Каршуноўскі горнаабагачальны камбінат. Маш.-буд. з-ды (абсталяванне для горнаруднай і хім. прамысловасці, чорнай і каляровай металургіі, станкі) у Іркуцку, Чарамхове, Ангарску, Усоллі-Сібірскім. Будаванне і рамонт суднаў у Ліствянцы, Качузе, Жыгалаве. Працуюць Іркуцкі (Шэліхаў) і Брацкі алюмініевыя з-ды. Хім. прамысловасць (Ангарск, Усолле-Сібірскае, Брацк), у Зіме і Тулуне гідролізныя з-ды. Дрэваапр. прамысловасць (Іркуцк, Зіма, Тулун, Тайшэт, Усолле-Сібірскае). У Брацку лесапрамысл. комплекс. Харч. прамысловасць. У Іркуцку чаепрасавальная ф-ка. С. гасп. збожжа-жывёлагадоўчага кірунку. У І. в. 100 калгасаў і 92 саўгасы (1971). Пасяўная пл. (тыс. *га*, 1970) 1491,5, з іх пад збожжавымі 922,3, кармавымі 493,1, агароднінна-бахчавымі і бульбай 73,9. Асн. збожжавая культура пшаніца (681 тыс. *га*). Сеюць авёс, ячмень, грэчку. Жывёлагадоўля малочна-мяснога кірунку. На пач. 1971 было (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 721,8 (у т. л. кароў 269,7), свіней 411, авечак і коз 407,1. Аленегадоўля (5,9 тыс. галоў паўн. аленяў), зверагадоўля і паляўнічы промысел, рыбалоўства. Даўж. чыгунак 1881 *км* (амаль усе электрыфікаваны), шашэйных дарог 16 тыс. *км* (1969). Суднаходства па Ангары, Лене, Віціме, Байкале. 7 ВНУ, 47 сярэдніх спец. навуч. устаноў. 4 т-ры, 5 музеяў. Абл. газ. «Восточно-Сибирская правда».

Літ.: Развитие минерально-сырьевой базы Иркутской области за 50 лет, Иркутск, 1967.

Я. Г. Гуцаў. Мінск.

ІРКУЦКІ УНІВЕРСІТЭТ імя А. А. Жданава, вышэйшая навуч. ўстанова. Засн. ў 1918 у складзе гісторыка-філал. і юрыд. ф-таў. Імя Жданава прысвоена ў 1939. Ф-ты ў 1971/72 навуч. г.: фізічны, матэм., хім., біёлага-глебавы, геалагічны, геагр., гістар., філал., юрыд.; падрыхтоўчы для грамадзян МНР, якія паступаюць у ВНУ СССР. Навучанне дзённае, вячэрняе і завочнае. Ёсць аспірантура. Пры ун-це НДІ (прыкладной фізікі; нафта- і вуглехім. сінтэзу ў г. Ангарску; біёлага-геагр.), вылічальны цэнтр, астр. абсерваторыя, бат. сад, б-ка, чатыры музеі (Байкальскі, заалаг., геолагаміпералагічны, глебавы). Прымае да абароны канд. і доктарскія дысертацыі. Выдае навук. працы.

ІРЛАНДЫЯ (Ireland), Ірландская Рэспубліка, Эйрэ (Eire), дзяржава ў Зах. Еўропе на аднайменным в-ве. Пл. 70,3 тыс. *км*². Нас. 2,9 млн. чал. (1970). Сталіца Дублін. Падзяляецца на 26 графстваў.



Дзяржаўны лад. І.— рэспубліка. Дзейнічае канстытуцыя 1937. На чале дзяржавы — прэзідэнт, які выбіраецца на 7 гадоў. Вышэйшы заканадаўчы орган — парламент, складаецца з прэзідэнта, палаты прадстаўнікоў і сената. Частка сенатараў назначаецца прэм'ер-міністрам, частка выбіраецца. Урад узначальвае прэм'ер-міністр.

Прырода. Большая частка тэр. І. занята Цэнтральнай раўнінай, укрытай ледавіковымі адкладамі. Шмат азёраў, балоты займаюць 20% тэр. краіны. Па ўскраінах — невысокія горы (600—800 *м* над узр. м.), найб. выш. 1041 *м* над узр. м. (г. Карантуіл) на ПдУ. Карысныя выкапні: торф, невялікія паклады кам. вугалю, жал. руды, пірыту, фасфарыту, гіпсу, палявога шпату. Клімат акіянічны. Сярэдняя т-ра ліп. ад 13 да 16 °С, студз. ад 4 да 7 °С. Ападкаў менш за 1000 *мм* на У і больш як 1200 *мм* за год на З. Рачная сетка густая. Найб. рака Шанан (384 *км*). Глебы пераважна падзолістыя, горна-падзолістыя і тарфяна-балотныя. Расліннасць лугавая, пашыраны верасовыя пустэчы. Лясы знішчаны. Жывёльны свет збеднены. У прыбярэжных водах — селядзец, траска, камбала і інш.

Насельніцтва. Большасць—ірландцы. Дзярж. мова ірландская і англійская. Рэлігія каталіцкая. Колькасць насельніцтва скарачалася ў сувязі з эміграцыяй (паводле перапісу 1821 ірландцаў у І. 6802 тыс. чал.). Найб. густа заселена ўсх. ч. краіны. Гарадскога нас. каля 45%. Найб. гарады (тыс. ж., 1966): Дублін (568,8), Корк (122,2), Лімерык (55,9).

Ірландыя. Горы Уіклаў.





Дублін. О'Кенел стрыт.

Гістарычны нарыс. Археолагі лічаць, што чалавек на тэр. І. жыў прыкладна за 6 тыс. гадоў да н. э. З 4 ст. да н. э. пачалося засяленне кельцкімі плямёнамі. У 3—12 ст. н. э. фарміравалася раннефеад. грамадства. Працэсу феадалізацыі спрыяла пашырэнне (5 ст.) хрысціянства. Аслабленая нападамі (795—1014) *нарманаў*, І. не здолела процістаяць уварванню (1169—71) англа-нармандскіх феадалаў. На ПдЗ І. ўтварылася англ. калонія. Адказам на каланізатарскую палітыку англічан былі паўстанні ірландцаў 1559—67, 1569—83 (з перапынкам у 1573—79), 1594—1603, 1641—52 і 1688—91. Задушыўшы іх, каланізатары канфіскавалі ірл. землі (да канца 17 ст. амаль $^6/_7$). Карэннае насельніцтва зганялася з зямлі. Сяліліся шатландскія і англ. пратэстанты. Пачаўся рэліг. падзел на католікаў і пратэстантаў. На падставе прыналежнасці да каталіцызму ірландцы былі пазбаўлены паліт. і грамадз. правоў. Англ. ўлады абмяжоўвалі ірл. гандаль і прамысловасць. Нац.-вызв. рух ірл. народа, які асабліва ўзмацніўся пад уплывам вайны за незалежнасць у Паўн. Амерыцы 1775—83 і франц. рэвалюцыі канца 18 ст., прымусіў англ. ўрад паслабіць калан. рэжым, увесці ў 1782—83 парлам. аўтаномію. Аднак пасля разгрому нац.-вызв. ірландскага паўстання 1798 каланізатары дамагліся ліквідацыі ірл. парламента (англа-ірл. унія 1801). Ірл. прадстаўнікам было выдзелена некалькі месцаў у англ. парламенце. У 19 ст. І. поўнасцю ператворана ў агр. прыдатак метраполіі. У 40-я г. 19 ст. пачаўся агр. пераварот. Дробная сялянская рэнта замянялася арэндай буйных зямельных участкаў — пашы. Калан. прыгнёт і феад. эксплуатацыя абвастрылі класавую барацьбу. Шырыўся рух за разрыў уніі 1801. У 1848 выбухнула паўстанне, якое задушылі англ. войскі. Пасля паражэння паўстання 1867 супраць згону сялян з зямлі цэнтр. месца ў паліт. жыцці краіны заняла барацьба за гомруль (самакіраванне ў межах *Брытанскай імперыі*). У ёй аб'ядналіся бурж.-ліберальныя элементы і рэвалюц.-дэмакр. крыло нац. руху. Але масавыя выступленні сялян напалохалі ірл. буржуазію. Яна пачала шукаць кампрамісу з англ. урадам. У канцы 19 ст. ў самастойную і актыўную барацьбу ўключаецца пралетарыят. Пад уплывам рускай рэв. 1905—07 адбыліся масавыя стачкі докераў (1907), дрэваапрацоўшчыкаў і чыгуначнікаў (1911), рабочых Дубліна (1913). У 1905 узнікла дробнабурж. партыя «Шын фейн» («Мы самі»), якая ў адрозненне ад гамрулераў выступала за паліт. і эканам. самастойнасць краіны. Нарастанне рэвалюц. сітуацыі прымусіла англ. парламент прыняць у маі 1914 закон пра гомруль, што сустрэла шалёнае супраціўленне рэакцыі, якая выступала пад фальшывым лозунгам абароны «незалежнасці» пратэстанцкага насельніцтва Паўн. І. Англ. ўрад адтэрмінаваў ажыццяўленне закону да заканчэння 1-й сусв. вайны. Гэтая акалічнасць побач з цяжкасцямі, выкліканымі вайной, і рэпрэсіямі англ. каланізатараў супраць барацьбітоў за незалежнасць стала прычынай ірландскага нац.-вызв. паўстання 1916. Нягледзячы на паражэнне, яно мела важнае значэнне для далейшай барацьбы ірл. народа, якая асабліва актывізавалася пасля Вял. Кастр. сацыяліст. рэв. У канцы 1918 партыя «Шын фейн» атрымала на выбарах у англ. парламент 73 месцы. Дэпутаты-шынфейнеры абвясцілі сябе першым ірл. урадам, у студз. 1919 — незалежнасць І. Явачна ствараліся нац. органы ўлады, узбр. сілы. Сфарміраваная ірл. рэсп. армія вяла ваен. дзеянні супраць англ. войск і паліцыі. Вырашальная роля ў гэтай вайне належала рабочым і сялянам, якія ўдзельнічалі ў узбр. барацьбе, падтрымлівалі яе стачкамі, байкотам калан. адміністрацыі. Не здолеўшы задушыць паўстання, англ. ўрад пайшоў на змову з ірл. буржуазіяй. Паводле мірнага дагавору 1921 краіна падзелена на дзве часткі. Паўн. І. (Ольстэр) асталася пад уладай Вялікабрытаніі, паўд. І. атрымала права дамініёна (т. зв. Ірландская свабодная дзяржава). На яе тэр. захаваліся англ. ваен. базы. Не змяніліся пазіцыі англ. капіталу. Нездаволенасць умовамі міру, раскол у кіраўніцтве партыі «Шын фейн» на прыхільнікаў дагавору 1921 і яго праціўнікаў (выступалі за рэспубліку) прывялі да грамадз. вайны 1922—23. Боязь лідэраў рэспубліканцаў падтрымаць сац. патрабаванні нар. мас спрыяла перамозе правых шынфейнераў. Устанавілася ўлада буйной буржуазіі. Праімперыялістычная і антырабочая палітыка яе ўрада выклікала рэзкае абвастрэнне класавай барацьбы. У 1932 да ўлады прыйшоў урад засн. ў 1926 партыі «Фіяна файл» («Салдаты лёсу»), якая на той час арыентавалася на настроі нар. мас і выступала за поўнае вызваленне ўсёй І. ад калан. залежнасці і за развіццё нац. эканомікі. У 1933 ва ўмовах уздыму рабочага руху засн. кампартыя І. (КПІ).

У 1937 прынята новая канстытуцыя. Яна адмяніла статус дамініёна, абвясціла «суверэнную дзяржаву Эйрэ» (ірл. назва І.), якая захоўвае толькі фармальныя сувязі з Вялікабрытаніяй. Паводле канстытуцыі Ольстэр названы часткаю нац. тэр. Эйрэ, на якую пакуль не распаўсюджваецца яе юрысдыкцыя. У 2-ю сусв. вайну І. трымалася нейтралітэту. У 1949 абвешчана рэспублікай і фармальна выйшла з Брытанскай імперыі. Захаваліся падзел краіны і калан. прыгнёт ірл. насельніцтва Ольстэра. Пануючыя колы Вялікабрытаніі перашкаджаюць аб'яднанню краіны. Цяжкае эканам. становішча працоўных, адсутнасць элементарных грамадз. правоў і дыскрымінацыя католікаў Паўн. І. прывялі летам 1969 да вострага паліт. крызісу. У Ольстэр былі

Дэманстрацыя аўтамабілебудаўнікоў фірмы «Брытэн», якія патрабуюць павышэння заработнай платы і паляпшэння ўмоў працы. Дублін. 1971.



ўведзены англ. войскі. Урад Эйрэ звярнуўся ў Савет Бяспекі ААН з просьбай разгледзець пытанне аб становішчы ў Ольстэры, заявіў, што не прызнае за Вялікабрытаніяй права ажыццяўляць юрысдыкцыю над якой-н. часткаю ірл. тэрыторыі. Масавыя арышты барацьбітоў за грамадз. правы і бязлітасныя рэпрэсіі англ. акупац. войск супраць католікаў абвастрылі адносіны паміж Вялікабрытаніяй і Эйрэ. У пач. 1972 мелі месца новыя злачынныя акты. 30 студз. англійскія парашутысты расстралялі мірную дэманстрацыю ў г. Дэры. Паслядоўным барацьбітом за адзінства краіны, за поўную нац. незалежнасць, за дэмакр. і сац. пераўтварэнні выступае рабочы клас Ольстэра і Эйрэ. У 1959 прафцэнтры абедзвюх частак краіны аб'ядналіся ў Ірл. кангрэс трэдюніёнаў, у сак. 1970 Камуніст. партыя Паўн. І. і Ірл. рабочая партыя (пераемніца традыцый КПІ, з 1948 да 1962 наз. Ірл. рабочая ліга) у адзіную КПІ. З 1955 І.— член ААН.

Гаспадарка. І. аграрна-індустрыяльная краіна. За апошнія дзесяцігоддзе значнае развіццё атрымала прамысловасць (32,4% нац. прадукту). Шэраг яе галін канцэнтруецца замежным, пераважна англійскім, капіталам. Павялічваецца прыток амер. і заходнегерм. капіталаў. Вядучыя галіны прамысловасці — харч. (малочная і мясная ў Корку, Уотэрфардзе, Лімерыку; піваварная і мукамольная ў Дубліне) і тэкст. (Дублін, Корк, Уотэрфард). Невялікія прадпрыемствы горназдабыўной, металург. (Корк), маш.-буд. прамысловасці. У Корку аўтамаб. з-д, энергамашынабуд. з-д у Фінгласе (каля Дубліна) і с.-г. машын у Уэксфардзе, Дандолку. У Шанане вытворчасць радыёапаратуры, суднабуд. верфі ў Дубліне, невялікі нафтаперапр. з-д у Уайтгеце. У 1970 выпрацавана 5,6 млрд. *кват-гадз* эл. энергіі. 70% яе даюць ЦЭС, якія працуюць на торфе. ГЭС на р. Шанан. С. гасп. дае каля $^1/_5$ нац. прадукту і забяспечвае 60% экспарту. Ворывам занята 16,9% тэр. краіны, каля 50% пад лугамі і пашаю. 10% найб. фермерскіх гасп. належыць палова с.-г. зямель. Развіта жывёлагадоўля. Асн. раёны — Пд, ПдЗ і З краіны, раён Дубліна. І. займае 1-е месца ў свеце па экспарце буйн. раг. жывёлы. У 1970 было (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 5229, авечак 2788, свіней 1065. Земляробства не забяспечвае патрэбы краіны ў хлебе. Гал. збожжавыя культуры: ячмень, пшаніца, авёс. Збор у 1970 (тыс. *т*): ячменю 800, пшаніцы 350, аўса 210. Вырошчваюць бульбу (1485 тыс. *т*, 1969), цукр. буракі, турнэпс, лён. Раёны земляробства — усх. графствы і графства Корк. Марское рыбалоўства. Аўтамаб. дарог каля 83 тыс. *км*, чыгунак 2,3 тыс. *км*. Вял. значэнне мае марскі і авіяц. транспарт. Гал. марскія порты: Дублін, Корк; аэрапорты: Шанан, Дублін. І. вывозіць жывёлу, прадукты жывёлагадоўлі, піва, тытунь, абутак, у апошнія гады расце вываз тэкстылю, радыёапаратуры, с.-г. машын; прывозіць машыны і абсталяванне, нафту і нафтапрадукты, вугаль, бавоўну, цэлюлозу, пшаніцу. Асн. гандл. партнёр — Вялікабрытанія (70% экспарту і 51% імпарту). Грашовая адзінка — ірландскі фунт.



Ірландыя. ЦЭЦ у Портарлінгтане.


ІРЛАНДЫЯ
Маштаб 1:5 000 000
50 0 50 100 км
8° з.д.
Ірландыя
Паўночная
Ірландыя
Белфаст
Дублін
Корк
Лімерык
Уотэрфард
Шанан
Ларн
Уэксфард
Уэксфард
Расслер-Харбар
Уэстпорт
Голуэй
Трали
Фаранфар
Бантры
Клонакілты
Балліна
Акіла
Ньюпорт
Трым
Дрохеда
Дандолк
Карлаў
Талаў
Арклаў
Уікларў
Порт-Лейіш
Атлон
Мулінгар
Атлон
Нейс
Брэй-Хэдлан
Дан-Лэры
Ньюры
Арма
Монаган
Клонс
Карык
Кілмеснарт
Трэлес
Кілкенні
Тэмплмор
Клонмел
Шэнан
Ньюкасл
Ньюкасл
Ньюкасл

комплексаў (арх. М. Скот і інш.), але горадабудаўніцтва развіта слаба.

Музыка. У ірл. сагах ёсць звесткі пра хар. спевы і шматгалоссе, аднак асталіся толькі аднагалосыя ўзоры нар. музыкі. У аснове яе ладавай будовы 7-ступенныя дыятанічныя лады з вылучэннем пентатонікі. Нар. танцы — жыга, рыл, хорнпайп. Асн. нац. інструмент — арфа, у суправаджэнні якой выконваліся песні бардаў (вандроўных, пазней прыдворных спевакоў-апавядальнікаў). Наладжваліся спаборніцтвы арфістаў. У 16—17 ст. вылучыліся першыя прафес. кампазітары-арфісты Р. Д. О'Каталін, браты Конеланы, пазней Т. О. Кэрален. Англ. заваёўнікі замаруджвалі развіццё нац. мастацтва; з узмацненнем іх прыгнёту ў 2-й пал. 17 ст. асабліва відавочнай стала арыентацыя ірл. правячых колаў на англ. прыдворную музыку. Страціўшы папулярнасць у І., мастацтва арфістаў у 18—19 ст. набывае ле ў Англіі і на кантыненце. Ірл. раманцічныя баладныя нар. песні выкарыстоўвалі англ. кампазітары ў баладнай оперы 18 ст., іх апрацоўваў Л. Бетховен. Многія ірл. музыканты працавалі за межамі І. (Дж. Філд у Расіі, М. У. Балф, Ч. Станфард, А. Бакс у Англіі і інш.). Сучасная І. не мае значных муз. дзеячаў. Працуюць сімф. аркестры і оперныя т-ры ў Дубліне, Корку, акадэмія музыкі ў Дубліне.

Тэатр. Доўгае панаванне англа-нарманаў згубна адбілася на развіцці ірл. (гэльскай) тэатр. культуры. У 14 ст. паэты-казачнікі выконвалі нар. легенды на гэльскай мове. У 16 ст. англ. цэхавыя гільдыі наладжвалі паказы містэрый. Першыя т-ры адкрыліся ў Дубліне ў 1637 і 1662. У 18 ст. паявіліся т-ры ў Белфасце і інш. гарадах. У 1899 створаны першы нац. «Ірландскі літ. тэатр». У 1901 арганізавана Ірл. нац. драм. т-ва, на аснове якога ўзнік пастаянны «Эбі тыэтр» (1904, Дублін), дзе ставіліся п'есы У. Б. Йітса, Дж. Сінга, Ш. О'Кейсі, Б. Шоў, Л. Робінсана. У 1904 арганізаваны «Ольстэр тыэтр» у Белфасце. У 1904 і 1914 у Дубліне працавалі 2 тэатр. калектывы на гэльскай мове. У 20-я г. створаны трупы ў Голуэе, Дубліне (вядомая трупа М. Мак-Ліямаіра, засн. ў 1929). Асн. тэатр. цэнтр — Дублін.

Літ.: Маркс К. і Энгельс Ф. Аб Англіі, Мн., 1954; Ленін У. І. Класавая вайна ў Дубліне.— Праз тыдзень пасля пабоішча ў Дубліне, Тв., т. 19 (Полн. собр. соч., т. 23); Яго ж. Англійскія ліберады і Ірландыя.— Канстытуцыйны крызіс у Англіі, Тв., т. 20 (там жа, т. 24, 25); Яго ж. Вынікі дыскусіі аб самавызначэнні, Тв., т. 22 (там жа, т. 30); Рабинович И. Е. Великобритания. Ирландия. Экономико-географический очерк, М., 1966; Керженцев П. Ирландия в борьбе за независимость, 3 изд., М., 1936; Сапрыкин Ю. М. Ирландское восстание XVII в., М., 1967; Колпаков А. Д. Ирландия — остров мятежный, М., 1965; Джексон Т. А. Борьба Ирландии за независимость, пер. с англ., М., 1949; Коннолли Дж. Рабочий класс в истории Ирландии.— Отвоевание Ирландии, пер. с англ., М., 1969; Искусство стран и народов мира, т. 2, М., 1965.
М. С. Вайтовіч (прырода, гаспадарка), *Л. М. Шнеерсон* (гістар. нарыс), *Дз. П. Бяляўкі* (ахова здароўя). Мінск; *В. П. Лапчынская* (асвета), *А. П. Саруханян* (літаратура). Масква.

ІРТЫШ, рака ў Зах. Сібіры і Казахстане, левы прыток Обі. Даўж. 4248 *км*, пл. бас. 1643 тыс. *км*².

Пачынаецца з ледавікоў Мангольскага Алтая (у Кітаі), да ўпадзення ў воз. Зайсан наз. Чорны Іртыш. Ніжэй прарэзвае хрыбты Алтая. На Зах.-Сібірскую раўніну выходзіць каля Сяміпалацінска. Гал. прытокі: левыя — Ішым, Вагай, Табол, Конда, правыя — Бухтарма, Ом, Тара, Дзям'янка. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Ледастаў з 2-й пал. ліст. да сярэдзіны красавіка. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 2830 *м*³/*сек*.

Суднаходны ад вусця на 3600 *км*. Багаты на рыбу: асетр, сцерлядзь, нельма, муксун, мянтуз, язь, чэбак. На І. пабудаваны Бухтарміпская ГЭС (675 тыс. *квт*), вадасховішча (пл. 5500 *км*², аб'ём 53 *км*³), Усць-Каменагорская ГЭС (332 тыс. *квт*), вадасховішча (пл. 37 *км*², аб'ём 0,65 *км*³). Пабудаваны канал І.— Караганда, даўж. 490 *км*. Гал. прыстані: Ханты-Мансійск, Табольск, Тара, Омск, Паўладар, Сяміпалацінск, Усць-Каменагорск.

ІРЫДЫЙ (Iridium), Ir, хім. элемент VIII групы перыяд. сістэмы Мендзялеева, ат. н. 77, ат. м. 192,2. Належыць да высакародных металаў. Адкрыты ў 1804. У зямной кары знаходзіцца 10^{-7}% па масе. Вядомы 2 стабільныя прыродныя ізатопы: ^{191}Ir (38,5%) і ^{193}Ir (61,5%).

І.— серабрыста-белы, цвёрды і крохкі метал, *t* пл. 2454 °С, *t* кіп. 4390 °С, шчыльн. 22 400 *кг*/*м*³. Хімічна вельмі ўстойлівы. К-ты на І. не дзейнічаюць. Растварацца толькі ў «царскай гарэлцы» (сумесі азотнай і салянай к-т). У рэакцыі ўступае пры т-ры чырв. напалу. Утварае комплексныя злучэнні. Ужываецца пераважна ў сплавах. Выкарыстоўваецца як каталізатар у нафтаперапрацоўчай прамысловасці.

Літ.: Плаксин И. Н. Металлургия благородных металлов, М., 1958; Некрасов Б. В. Основы общей химии, т. 3, М., 1970; Вимиш Ф. Аналитическая химия благородных металлов, ч. 1—2, пер. с англ., М., 1969.

ІРЫЗАЦЫЯ (ад грэч. Iris вясёлка), вясёлкавая змена афарбоўкі на рэчывах. Трапляецца ў некаторых мінералаў (напр., лабрадор, апал, кальцыт), на плёнках газы, нафты, масла на вадзе. Стракатафарбаваныя плёнкі на мінералах (бурых жалезняках, барніту і інш.), якія ірызуюць, называюцца пабегласцямі.

ІРЫНІН (сапр. Бурштын) Барыс Сяргеевіч [29.7(10.8).1893, в. Заплюссе Лужскага пав. Пецярбургскай губ.— 4.4.1964], рускі савецкі паэт-перакладчык. Скончыў Маскоўскі ун-т (1918). Друкавацца пачаў у 1913. З 1938 перакладаў на рус. мову творы паэтаў сав. нац. рэспублік — укр., бел., літ., чувашскіх і інш. Пераклаў паасобныя вершы М. Багдановіча, П. Броўкі, М. Танка, паэму Я. Коласа «Рыбакова хата» (з С. Гарадзецкім і П. Сямыніным, 1949) і інш.

ІРЭЗІНЭ (Iresine), род травяністых раслін і паўкустоў сям. аксамітнікавых. Вядома каля 75 відаў, пашыраных у трапічнай і субтрапічнай Амерыцы.

Сцябло прамастойнае або павойнае; лісце супраціўнае, цэласнае; кветкі ў мяцёлчатых суквеццях. На Беларусі культывуюць І. Lindeni з цёмна-пурпуровым лісцем як дэкар. дывановую і пакаёвую расліну. Размнажаецца чаранкамі.

Літ.: Гл. пры арт. *Дэкаратыўныя расліны*.

ІСА, рака, правы прыток р. Шчары (бас. Нёмана). Даўж. 62 *км*. Цячэ ў Баранавіцкім р-не Брэсцкай і Слонімскім р-не Гродзенскай абл. Вадазбор (554 *км*²) у межах паўд.-зах. схілаў Навагрудскага ўзв. Рэльеф узгорыста-марэнны. Пад балотамі 7%, пад лесам 26, разарана 45% тэр. Шыр. даліны пераважна 0,5—0,8 *км*. Самы значны прыток р. Пляхоўка (правы). Жыўленне мяшанае. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 3,6 *м*³/*сек*. На І. каля г. Слоніма і в. Нагуевічы плаціны.

ІСААКЯН Аветык Саакавіч [18(30).10.1875, в. Казарапат Александропальскага пав. Эрыванскай губ.— 17.10.1957], армянскі савецкі паэт. Акадэмік АН Арменскай ССР (1943). Вучыўся ў Эчміядзінскай духоўнай семінарыі (1889—91), Лейпцыгскім ун-це (1893—95). За рэвалюцыйную дзейнасць на радзіме быў арыштаваны (1896), сасланы ў Адэсу

(1897). З 1911 у эміграцыі (Канстанцінопаль, Жэнева, Берлін, Парыж). З 1930 да 1936 у Францыі, выступаў як сябар Сав. Саюза. У 1936 вярнуўся на радзіму. Друкавацца пачаў у 1892. Першы аб. вершаў («Песні і раны», 1897) прасякнуты любоўю да арм. народа, які пакутаваў ад уціску султанату і царызму, поўны горкіх разваг пра лёс чалавека. У творах 1905—07 заклік да актыўнай барацьбы супраць сац. і нац. прыгнёту, матывы тугі і адчаю. У паэме «Абул Ала Маары» (1909) І. гнеўна выкрыў асновы бурж. грамадства. У вершах, напісаных за мяжою, гучыць мара пра свабоду, туга па родным краі. У паэме «Мгер з Сасуна» (1919, выд. і перапрац. 1937) адлюстраваў жыццё і барацьбу арм. сялян перыяду феадалізму. Аўтар усх. легендаў і паэм у прозе «Ліліт», «Лі-Таі-По», гістар. балады «Нашы продкі», патрыят. вершаў часоў Айч. вайны («Ратны покліч», «Сэрца маё на вяршынях гор», «Дзень вялікай перамогі» і інш., Дзярж. прэмія СССР 1946). Паэзіі І. ўласцівыя лірызм, народнасць, прастата, шырыня творчага дыяпазону, музыкальнасць. Творы І. пераклі А. Блок, В. Брусаў. Многія вершы І. сталі нар. песнямі. Старшыня СП Арменіі (1946—57). Узнаг. 2 ордэнамі Леніна.

Тв.: Бел. пер.— у кн.: Кветкі Арарата. Апавяданні армянскіх савецкіх пісьменнікаў, Мн., 1964; рус. пер.— Избр. соч., т. 1—2, М., 1956; Избранное, М., 1970.
Літ.: Григорьян К. Творческий путь Аветика Исаакяна, М., 1963.

ІСАЕВА Марыя Сцяпанаўна [н. 1(14).4.1910, в. Надручаеўская Вельскага пав. Валагодскай губ.], перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1936. У 1954—69 агранам калгаса «Новае жыццё» Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам «Знак Пашаны», медалямі. Жыве ў Рэчыцы.

Літ.: Мішкевіч І. Белыя лілеі, у кн.: Сцяганосцы новага, перадавога, Мн., 1967.

ІСАЕНКА Іван Васілевіч (н. 1.1.1922, в. Прудок Чэрыкаўскага пав. Гомельскай губ.), наватар вытворчасці, Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1943. Удзельнік Айч. вайны. У 1947—56 на прадпр. малочнай прамысл. ў Магілёўскай вобл. і Стаўрапольскім краі. З 1956 на Рагачоўскім малочнакансервавым камбінаце — пам. майстра, майстар, старшы майстар. Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі.

ІСАЕЎ Васіль Яфімавіч (н. 1915, Маскоўская губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1942. На фронце з 1941, камандзір узвода сувязі. Вызначыўся ў вер. 1943 у Камарынскім р-не Палескай вобл. Падраздзяленне на чале з І. фарсіравала Дняпро, забяспечыла сувязь з камандаваннем палка. 30 вер. і 1.10. 1943 двойчы падымаў байцоў у штыкавую атаку і адкідаў ворага на выходны рубеж. Жыве ў Нагінску Маскоўскай вобл.

ІСАЕЎ Рыгор Пракопавіч (10.1.1857, Магілёў—25.3.1886), рэвалюцыянер-народнік. З разначынцаў. У час навучання ў Магілёўскай гімназіі стаў членам тайнага гуртка самаадукацыі, распаўсюджваў забароненую л-ру. Удзельнік студэнцкага руху 1878—79 у Пецярбурзе, падтрымліваў сувязь з гуртком магілёўскіх гімназістаў, уплываў на фарміраванне іх поглядаў. З 1879 чл. тэрарыст. групы «Свабода або смерць», потым «Народнай волі» і яе выканкома. Удзельнік падрыхтоўкі замаху на цара пад Масквою, у Адэсе і Пецярбурзе, рыхтаваў з М. І. Кібальчычам выбуховыя рэчывы. Арыштаваны ў крас. 1881 і па працэсе 20-ці асуджаны да пакарання смерцю, якое заменена вечнай катаргаю. Памёр ад сухотаў у Шлісельбургскай крэпасці.

Літ.: Якимова А. В., Г. П. Исаев, М., 1930; Фигнер В. Н. Полн. собр. соч., т. 4, М., 1932.

ІСАЙКА Міхаіл Анісімавіч (н. 1908, в. Верадзеева Ніжагародскага пав.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1944. У Чырв. Арміі з 1942. Вызначыўся ў баі пад Магілёвам. У чэрв. 1944 рота на чале з І. фарсіравала Дняпро, захапіла плацдарм, адбіла 5 варожых контратак. Асабіста знішчыў варожы танк і шмат гітлераўцаў. Жыве ў Горкім.

ІСАКАЎ Георгій Пятровіч [30.1(11.2).1896, в. Вялікая Крушынаўка Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ.— 4.2.1961], Герой Сав. Саюза (1943), ген.-м. (1943). З сялян. Чл. КПСС з 1944. Скончыў БДУ (1929). У Чырв. Арміі з крас. 1918. Удзельнік грамадз. вайны на Зах. фронце — нач. школы камсаставу, нам. камандзіра палка. У 1922—24 нам. старшыні Рагачоўскага пав. выканкома. У 1924—32 на прафс. і сав. рабоце ў Мінску. З 1932 нач. упраўлення к-та нарыхтовак пры СНК БССР. У Айч. вайну на Зах., Сталінградскім, Данскім, 3-м Бел. франтах — камандзір палка, брыгады, дывізіі. Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра на Пд ад Крамянчуга. У 1946—55 камандзір злучэння, нач. ваен. кафедры.



ІСАКАЎ Іван Сцяпанавіч [22.8(3.9).1894, с. Аджыкенд Бакінскай губ.— 11.10.1967], савецкі ваенна-марскі дзеяч, адмірал флоту Сав. Саюза (1955). Герой Сав. Саюза (1965). Чл.-кар. АН СССР (1958), праф. (1943). З сялян. Чл. КПСС з 1939. Скончыў Вышэйшыя акад. курсы



(1928). На флоце з 1914. Удзельнік грамадз. вайны на Балт. флоце, Волзе і Каспіі. З 1929 нач. марскога сектара Ген. штаба РСЧА, ст. выкладчык Ваен.-марской акадэміі, камандуючы Балт. флоту. У 1938—41 нам. наркома ВМФ. У Айч. вайну каардынаваў балвыя дзеянні ВМФ з наземнымі войскамі, адначасова нам. галоўнакамандуючага Паўн.-Зах., Паўн.-Каўказскага напрамкаў, потым нам. камандуючага Закаўказскага фронту. З 1946 нач. Галоўнага марскога штаба, нам. галоўнакамандуючага ВМФ, чл. Ваен. Савета, навук. кансультант, генеральны інспектар. Аўтар навук. прац, у т. л. «Прыморскія крэпасці» («Морской сб.», 1945, № 1, 8—9, 1946, № 2, 8—9); «Аперацыя японцаў супраць Цындао ў 1914 г.» (1936). Дэп. Вярх. Савета СССР 1-га скл. Дзярж. прэмія СССР 1951. Узнаг. 6 ордэнамі Леніна, 7 інш. ордэнамі, медалямі, 3 ордэнамі замежных краін.

Тв.: Морские истории, М., 1970.

В. С. Фядосенка. Масква.

ІСАКО́ВІЧ Уладзімір Мікалаевіч [11(23).3.1893, Мсціслаў Магілёўскай губ.— 10.11.1966], удзельнік барацьбы за ўладу Саветаў. З сялян. Чл. КПСС з 1914. З 1907 рабочы ў Харкаве. У рэвалюц. дзейнасць уключыўся з 1913. Удзельнік падрыхтоўкі Кастр. рэвалюцыі ў Харкаве. З 1918 адзін з арганізатараў і камісар 1-й Укр. сав. дывізіі, якая дзейнічала на тэр. Гомельшчыны і Чарнігаўшчыны, камісар Тарашчанскага палка гэтай дывізіі, камісар Харкаўскай групы войск, працаваў у Зах. франтавым бюро ЦК КП(б)У. У 1920 камісар Херсонскай групы войск. Пасля грамадз. вайны на парт. і сав. рабоце. У Айч. вайну на палітрабоце ў Чырв. Арміі. З 1945 на парт. і выдавецкай рабоце ў АН УССР. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.

ІСАКО́УСКІ Міхаіл Васілевіч [н. 7(19).1.1900, в. Глотаўка Ельнінскага пав. Смаленскай губ.], рускі савецкі паэт. Герой Сац. Працы (1970). Засл. дз. культ. БССР (1968). Чл. КПСС з 1918. З беднай сялянскай сям'і. З 1919 рэдактар газ. ў Ельні; у 1921—31 супрацоўнік смаленскай абл. газ. «Рабочий путь». Першы верш надрукаваў у 1914. Зб. «Правады ў саломе» (1927) быў прыхільна сустрэты М. Горкім. Вершы 30-х г. апяваюць сацыялістычную перабудову вёскі, прасякнуты глыбокім адчуваннем прыроды, паэзіяй сельскай працы (зб. «Правінцыя», 1930; «Майстры зямлі», 1931; «Чатыры жаданні», 1936). У Айч. вайну ўслаўляў гераізм сав. людзей (зб. «Новыя вершы», 1942; «Наказ сыну», 1943). Аўтар кн. «Пра паэтычнае майстэрства» (1952), «Пра паэтаў, пра вершы і песні» (1968). Творчае развіццё традыцый рус. класічнай паэзіі, блізкасць да фальклору, лірычная напеўнасць, меладычнасць — адметныя рысы творчасці І. Многія вершы І. пакладзены на музыку і сталі нар. песнямі. Пераклаў вершы і паэмы А. Александровіча, М. Багдановіча, П. Броўкі, М. Васілька, П. Глебкі, Я. Коласа, Я. Купалы, А. Куляшова, П. Панчанкі, А. Русака, бел. нар. песні, паэму «Тарас на Парнасе». Дзярж. прэміі СССР 1943, 1949. Узнаг. 4 ордэнамі Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі.



Тв.: Собр. соч., т. 1—4, М., 1968—69; бел. пер.— Выбр. тв., Мн., 1952.

Літ.: Рыленков Н. (сост.). Народный поэт, Смоленск, 1950; Твардовский А. Поэзия М. Исаковского, М., 1969.

ІСА́НІН Мікалай Мікітавіч [н. 23.4(6.5).1904, Масква], савецкі вучоны ў галіне суднабудавання. Акад. АН СССР (1970), д-р тэхн. н. (1963). Герой Сац. Працы (1963). Чл. КПСС з 1926. Скончыў Ленінградскі караблебудаўнічы ін-т (1935). Навук. працы па суднабудаванні. Дэп. Вярх. Савета СССР 7—8-га скл. Дзярж. прэмія СССР 1942, Ленінская прэмія 1959. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.

ІСА́ЧАНКА Аляксандр Лаўрынавіч (1919, в. Хоўла Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ.— 7.10.1942), Герой Сав. Саюза (1944). З сялян. Чл. КПСС з 1939. Скончыў Рэчыцкае пед. вучылішча. Да Айч. вайны сакратар Гомельскага гаркома камсамола. З жн. 1941 у гомельскім гарадскім партызанскім атрадзе «Бальшавік» — падрыўнік, разведчык. Адзін з першых пачаў выплаўляць тол са снарадаў. Група падрыўнікоў, якую ўзначальваў І., пусціла пад адхон 58 варожых эшалонаў, знішчыла 87 аўтамашын, танкаў, браневікоў. Загінуў пры падрыхтоўцы да баявога задання.



Літ.: Люди легенд, в. 1, М., 1965, с. 503—510.

ІСА́ЧАНКА Барыс Лаўрынавіч [2(14).6.1871, Пецярбург — 17.11.1948], савецкі мікрабіёлаг. Акад. АН СССР (1946) і АН УССР (1945). Скончыў Пецярбургскі ун-т (1895), дзе з 1918 прафесар кафедры мікрабіялогіі. Адначасова дырэктар Бат. саду АН СССР (1917—30). З 1937 дырэктар Ін-та мікрабіялогіі АН СССР. Працы па агульнай, с.-г., тэхн., геал. мікрабіялогіі, па мікрабіялогіі паўн. мораў, Чорнага м. і газевых азёраў. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга.

Тв.: Избранные труды, т. 1—3, М.— Л., 1951—57.

ІСА́ЧАНКА Іван Фёдаравіч [н. 14(27).11.1907, в. Канец Сенненскага пав. Магілёўскай губ.], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Мінскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1930. Скончыў Рэсп. парт. школу пры ЦК КП(б)Б (1948). Працаваў рабочым у Ленінградзе, з 1929 у Чырв. Арміі, з 1938 на сав. і парт. рабоце. З мая 1942 камісар атрада «Гвардзеец», з якім прыбыў з сав. тылу на тэр. Мінскай вобл. Са студз. 1944 камісар партызанскай брыгады імя П. К. Панамарэнкі Мінскай вобл. Пасля вайны на парт., сав., гасп. рабоце. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі. Жыве ў г. п. Крупкі.

ІСЕРНА, вёска ў Слуцкім р-не Мінскай вобл., на р. Случ. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Мічурына. За 20 *км* на ПдУ ад Слуцка, 125 *км* ад Мінска, 18 *км* ад чыг. ст. Слуцк, каля аўтамаб. дарогі Слуцк — в. Пагост (1 *км*). 518 ж., двароў 147 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, бальніца, аддз. сувязі, магазін. Помнік на брацкай магіле 9 сав. воінаў і партызан Айч. вайны.

ІСІДА (грэч. Isis), у старажытнаегіпецкай міфалогіі багіня ўрадлівасці, мацярынства, апякунка жыцця і здароўя багоў і людзей. Сястра і жонка *Асірыса*, якога ўваскрэсіла.

Культ І. ў эпоху элінізму пашырыўся ў Грэцыі, М. Азіі, Сірыі, з 1 ст. да н. э. ў Рыме. Некаторыя рысы І. хрысціянская традыцыя перанесла на *багародзіцу*. Святы ў гонар І. мелі характар містэрый.

Літ.: Матье М. Э. Древнеегипетские мифы, М.— Л., 1956.

ІСІПІН Аляксандр Іванавіч [н. 11(24).10.1911, Баку], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). У Чырв. Арміі з 1941. Вызначыўся на тэр. Сіроцінскага р-на Віцебскай вобл. 23.6.1944 каля в. Казаногава ўварваўся ў траншэі і закідаў ворага гранатамі. 25 чэрв. адзін з першых фарсіраваў Зах. Дзвіну і кулямётным агнём прыкрываў пераправу сав. войск. Жыве ў г. Балашове Саратаўскай вобл.

ІСК, пісьмовае патрабаванне адной асобы ці арганізацыі (істца) да другой (адказчыка), пададзенае ў суд; сродак узбуджэння судовай справы па грамадзянскіх, працоўных, сямейных і інш. спрэчках. І. можа змяшчаць просьбу ўзнавіць парушанае права, пацвердзіць паяўпасць ці адсутнасць праваадносін, прымусіць адказчыка выканаць абавязацельства.

ІСКАЛІЕ́Ў Сундуткалі (1924, с. Канстанцінаўка Уральскага пав.— 24.6.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). 24.6.1944 у баі каля в. Лудчыцы Быхаўскага р-на Магілёўскай вобл. адзін з першых уварваўся ў траншэі праціўніка. Каб спыніць агонь варожага дзота, закрыў амбразуру сваім целам.

ІСКАНЬ, вёска ў Абідавіцкім с/с Быхаўскага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр калгаса «Іскра». За 35 *км* на ПдУ ад Быхава, 65 *км* ад Магілёва. 466 ж., двароў 153 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Помнік на брацкай магіле 2 сав. воінаў Айч. вайны і 4 мірных жыхароў вёскі, загубленых 14.10.1941 ням.-фаш. захопнікамі.

ІСКРА, вёска ў Ланькаўскім с/с Бялыніцкага р-на Магілёўскай вобл., на левым беразе р. Друць. Цэнтр калгаса імя Ільіча. За 10 *км* на Пн ад Бялыніч, 54 *км* ад Магілёва. 159 ж., гасп. 41 (1971). Магазін. Помнік на брацкай магіле 216 сав. воінаў Айч. вайны.

«ЙСКРА», першая агульнарускаая палітычная нелегальная марксісцкая газета, створаная У. І. Леніным. Выдавалася з 11(24).12.1900, спачатку ў Лейпцызе (№ 1), потым у Мюнхене, з крас. 1902 у Лондане, з вясны 1903 у Жэневе; з сярэдзіны 1901 штомесячна, з 1902 кожныя два тыдні. Тыраж 8—10 тыс. экз. Ленін — ініцыятар і арганізатар «И.», яе ідэйны кіраўнік і гал. рэдактар; распрацоўваў план кожнага нумара газеты, знаходзіў аўтараў, рэдагаваў артыкулы, пісаў артыкулы па найбольш важных пытаннях буд-ва партыі і рэвалюц. руху (у 1900—03 у «И.» надрукавана больш за 50 арт. Леніна).

У склад рэдакцыі «И.» ўваходзілі У. І. Ленін, Г. В. Пляханаў, Л. Мартаў, П. Б. Аксельрод, В. І. Засуліч, А. М. Потрасаў; сакратар «И.» з крас. 1901 — Н. К. Крупская. Асн. мэта «И.» — стварэнне ў Расіі марксісцкай партыі. План стварэння адзінай цэнтралізаванай марксісцкай партыі з дапамогай агульнарус. паліт. газеты склаўся ў Леніна ў ссылцы (с. Шушанскае) у 1899—1900. Умовы таго часу характарызаваліся стыхійнасцю ў рабочым руху, арганізацыйнай раздробленасцю с.-д. к-таў, груп і гурткоў, якія не мелі ні ідэйнай, ні арганізацыйнай сувязі. Рэдакцыя «И.» пад кіраўніцтвам Леніна распрацавала праект праграмы марксісцкай партыі (надрукаваны ў чэрв. 1902) і статут партыі. «И.» стала ідэйным і арганізацыйным цэнтрам расійскіх рэвалюц. сацыял-дэмакратаў, паліт. кіруючым цэнтрам рабочага руху краіны. Газета выкрывала антынародную палітыку царызму, рыхтавала масы да рэвалюцыі, адстойвала рэвалюц. марксісцкую тэорыю ў барацьбе супраць апартуніэму і бурж. нацыяналізму, паслядоўна ўкараняла сацыялізм. свядомасць у масы пралетарыяту, выхоўвала яго ў духу інтэрнацыяналізму. «И.» мела пастаянныя аддзелы: «З нашага грамадскага жыцця», «Хроніка рабочага руху і пісьмы з фабрык і заводаў», «Міжнародны агляд», «З эканамічнага жыцця», «З партыі»; «Хроніка рэвалюцыйнай барацьбы», «З вёскі», «Паштовая скрынка», «Аб'явы». Акрамя газеты, рэдакцыя «И.» выдавала час. «Заря», арганізавала сваё выдавецтва, якое выпусціла за 3 гады больш за 50 кніг, брашур, праклямацый.

Рэдакцыя «И.» стварыла шырокую сетку агентаў газеты (гл. *Агенты «Искры»*), у студз. 1902 у Самары — Бюро рускай арг-цыі «Искры». «И.» распаўсюджвалася па ўсёй краіне. Рэгулярна паступала газета і ў Беларусь. Яе атрымлівалі і чыталі рабочыя Мінска, Мазыра, Магілёва, Брэста, Віцебска, Гомеля, Гродна, Оршы, Копысі, Смаргоні, Шклова і інш. гарадоў. Яны аказвалі «И.» і матэрыяльную падтрымку. Па ўсёй краіне дзейнічалі іскраўскія групы. На Беларусі яны існавалі ў Мінску, Гомелі, Віцебску, Копысі, Горках. На базе іх ствараліся групы РСДРП. Сацыял-дэмакраты Беларусі ажыццяўлялі су-


РОССІЙСКАЯ СОЦІАЛЬ-ДЕМОКРАТИЧЕСКАЯ РАБОЧАЯ ПАРТІЯ

ИСКРА

вязь з «И.» праз віленскую групу транспартавання іскраўскай л-ры і палтаўскую групу садзеяння «И.». У Мінску, Магілёве, Гомелі, Віцебску, Гродне, Пінску, Смаргоні, Шклове, Копысі і інш. гарадах былі карэспандэнты газеты. «И.» паведамляла пра забастоўкі і стачкі рабочых у Мінску, Гомелі, Магілёве, Смаргоні, Гродне, Пінску, пра выступленне сялян у Ашмянскім пав., якое ахапіла 32 вёскі, пра маніфестацыі 700 рабочых Віцебска ў сувязі з адпраўкай ссыльных рабочых у Сібір і інш. (№ 4, 6, 7, 11, 13). Ацэньваючы паліт. дэманстрацыі, якія праходзілі ў крас.— маі 1901 у многіх гарадах Беларусі, «И.» адзначала іх моцныя і слабыя бакі, вітала той факт, што іскраўскія лозунгі «Далоў самадзяржаўе!», «Няхай жыве сацыялізм!» станавіліся лозунгамі мас. «И.» адыграла вырашальную ролю ў барацьбе рэвалюц. сацыял-дэмакратаў Беларусі з апартунізмам, сепаратызмам і нацыяналізмам Бунда.

II з'езд РСДРП пастанавіў адзначыць выключную ролю «Искры» ў стварэнні партыі і аб'явіў яе цэнтр. органам РСДРП; выбраў рэдакцыю «И.» ў складзе Леніна, Пляханава, Мартава. Апошні адмовіўся ад удзелу ў рабоце рэдакцыі. Нумары 46—51 «И.» выйшлі пад рэдакцыяй Леніна і Пляханава. 18(31).10.1903 Пляханаў патрабаваў кааптаваць у склад рэдакцыі былых рэдактараў «И.», адхіленых II з'ездам. Ленін не мог згадзіцца з гэтым і 19.10(1.11).1903 заявіў аб сваім выхадзе з рэдакцыі «И.». З № 52 «И.» стала органам меншавікоў. Яна хутка страціла свой уплыў на масы, у 1905 выданне яе спынілася.

Барацьба «И.» за стварэнне партыі новага тыпу мела жыццёва важнае значэнне не толькі для рэвалюц. руху ў Расіі, але і для ўсяго міжнар. рабочага руху. Ленінская «И.» дала пачатак шырокаму развіццю ў Расіі, у т. л. на Беларусі, *бальшавіцкага друку*. Рэвалюц. традыцыі «И.» развіваюцца друкам Сав. Саюза, камуніст. і рабочым друкам.

Літ.: Ленін У. І. Праект заявы рэдакцыі «Искры» і «Зари».— Як ледзь не патухла «Искра».— Неадкладныя задачы нашага руху, Тв., т. 4 (Полн. собр. соч., т. 4); яго ж. З чаго пачаць?, Тв., т. 5 (там жа, т. 5); яго ж. Што рабіць?, Тв., т. 5 (там жа, т. 6); яго ж. Матэрыялы да выпрацоўкі праграмы РСДРП, Тв., т. 6 (там жа, т. 6); яго ж. II з'езд РСДРП 17(30) ліпеня — 10(23) жніўня 1903 г., Тв., т. 6 (там жа, т. 7); яго ж. Крок уперад, два крокі назад, Тв., т. 7 (там жа, т. 8); Ленинская «Искра». К 50-летию со дня выхода первого номера, М., 1950; Ленинская «Искра» (К семидесятилетию со дня выхода первого номера), М., 1970; Переписка В. И. Ленина и редакции газеты «Искра» с социал-демократическими организациями в России, т. 1—3, М., 1969—70; Степанов В. Н. Ленин и русская организация «Искры». 1900—1903, М., 1968; Ефремова О. Ленинская «Искра» и ее роль в распространении марксизма в Белоруссии, у кн.: Из истории борьбы за распространение марксизма в Белоруссии (1883—1917), Мн., 1958; Біч М. Ленінская «Искра» і Беларусь, «Полымя», 1970, № 12; Кузняев А. На пути к Октябрю, Мн., 1970; Ленинская «Искра» (дек. 1900—1960). Библиография, М., 1961. *С. В. Марцэлеў.* Мінск.

«ІСКРА», спецыяльная партыз. група НКДБ БССР, якая ў Айч. вайну змагалася супраць ням.-фаш. захопнікаў на Беларусі. 28.10.1943 група (4 чал.) перапраўлена ў варожы тыл. Камандзір М. П. Хахлоў (псеўданім Гамаў). Дзейнічала на тэр. Брэсцкага, Кобрынскага, Антопальскага, Жабінкаўскага, Дзівінскага, Маларыцкага р-наў Брэсцкай вобл., Драгічынскага р-на Пінскай вобл. Партызаны групы пусцілі пад адхон 34 варожыя эшалоны, знішчылі і пашкодзілі больш за 450 вагонаў і платформаў, 66 аўтамашын, 4 гарматы, вывелі са строю цэх лесапільнага з-да, дзе выраблялiся фюзеляжныя рамы для самалётаў, узарвалі больш за 500 *м* чыгункі; здабылі і перадалі камандаванню Чырв. Арміі звесткі пра абарончыя збудаванні ворага ўздоўж Буга, план размяшчэння ў Брэсце і яго наваколлі ваен. аб'ектаў. Частка групы (21 чал.) злучылася з Чырв. Арміяй 8.4.1944, другая частка (15 чал.) — 24.7.1944.

Літ.: Ковальский П. В брестских лесах. Записки партизана, Мн., 1970; Боровский А. И. О них молчали сводки, Мн., 1970.

І. С. Барысаў, А. Дз. Рудак. Мінск.

«ІСКРЫ ІЛЬІЧА», назва дзіцячага часопіса *«Бярозка»* з кастр. 1929 да крас. 1941.

«ИСКУССТВО», часопіс пададдзела мастацтва аддзела народнай асветы Віцебскага губвыканкома і Саюза работнікаў мастацтва Віцебска. Выдаваўся ў 1921 у Віцебску на рус. мове. У 1922 аб'яднаны з час. «Работник просвещения», выходзіў пад назвай «Работник просвещения и искусства».

ІСЛАМ (араб. islām пакорнасць), мусульманства, адна з найбольш пашыраных сусветных рэлігій, паслядоўнікі якой складаюць значную частку насельніцтва ў краінах Б. Усходу, Сярэдняга Усходу, Паўд.-Усх. Азіі і Паўн. Афрыкі. Узнік у пач. 7 ст. ў Зах. Аравіі.

У працэсе складвання класавага грамадства і дзяржавы бог найбольш магутнага араб. племені курэйш «аль-ілах» пад імем Алаха ўвайшоў у новую рэлігію як адзінадзяржаўны бог, «стваральнік нябёс і зямлі». На фарміраванне І. зрабілі ўплыў монатэістычныя рэлігіі — *хрысціянства, іудаізм* і зараастрызм. Актыўная роля ў пашырэнні І. належала *Мухамеду*, якога бурж. гісторыкі абвяшчаюць «заснавальнікам» І. Веравучэнне І. выкладзена ў *Каране*, лічыць абавязковай веру ва ўсемагутнага Алаха і яго прарока Мухамеда, у святасць Карана, неўміручасць душы, уваскрэсенне ў дзень страшнага суда і да т. п. У Араб. халіфаце І. зменьваўся, адлюстроўваючы сац.-эканам. і паліт. інтарэсы феадалаў. Гэта знайшло адлюстраванне ў суне (кадыфікавана ў 9 ст.) — свяшчэнным паданні, якое апавядае пра дзеянні і павучанні Мухамеда. Каран і суна сталі асноваю феад.-мусульм. права — шарыяту. Большасць мусульман — суніты, якія прызнаюць Каран і суну свяшчэннымі кнігамі. Шыіты прызнаюць толькі Каран. Месяц рэліг. посту (рамадан) і інш. рэліг. святы (курбан-байрам, ураза-байрам) маюць вял. значэнне для падтрымкі ўплыву на веруючых-мусульман.

У канцы 19 ст. ў І. ўзнік рэфарматарскі кірунак, што меў за мэту дастасаваць ідэалогію і арганізацыю І. да бурж. адносін, а таксама «панісламізм» — рэакц. паліт. вучэнне, якое заклікае да аб'яднання мусульм. народаў для барацьбы супраць «наступлення хрысціянскага Захаду». У. І. Ленін падкрэсліваў «неабходнасць барацьбы з панісламізмам і падобнымі плынямі, якія спрабуюць злучыць вызваленчы рух супраць еўрапейскага і амерыканскага імперыялізму з умацаваннем пазіцыі ханаў, памешчыкаў, мулаў і т. п.» (Тв., т. 31, с. 126). Спробы выкарыстаць І. як ідэалогію нац.-вызв. барацьбы не мяняюць яго рэакц. сутнасці. У СССР паслядоўнікі І. жывуць пераважна ў рэспубліках Сярэдняй Азіі, у Каз. ССР, Азерб. ССР, Тат. АССР, Башк. АССР і

ў інш. раёнах. Мусульм. духавенства, якое выступала супраць Кастр. рэвалюцыі, Сав. улады і калектывізацыі, стала лаяльным да Сав. улады, прыстасоўваецца, абвяшчае лжывую ідэю сумяшчальнасці камуніст. і мусульм. ідэалогіі.

Літ.: Мавлютов Р. Р. Ислам, М., 1969; Климович Л. И. Ислам, 2 изд., М., 1965.

Ю. М. Манін. Мінск.

ІСЛАМАБА́Д, сталіца Пакістана. Размешчана на плато Потвар, на поўначы краіны. Нас. 100 тыс. чал. (1970). У Нац. парку, пасаджаным на Пд і ПдУ ад І., ствараюцца Нац. ун-т, Ін-т атамнай энергіі, Нац. цэнтр здароўя; спартыўныя збудаванні. І. пабудаваны ў 1961—70 паводле рашэння (1959) урада аб пераносе сталіцы з Карачы.

ІСЛА́НДСКАЯ ДЭПРЭ́СІЯ, вобласць паніжанага атмасфернага ціску на Пн Атлантычнага ак. з цэнтрам паблізу Ісландыі. Зімою вялізнае адгалінаванне ідзе на ПнУ да Баранцавага і Карскага мораў. Ціск у цэнтры І. д. ў студз. ніжэй за 996 *мб*, у ліп. 1010 *мб*.

І. д.— вынік пераходу паветра ў верхніх слаях атм. з акіяна на кантынент Еўропы і Азіі. Каля паверхні зямлі адносна цёплае марское паветра прымае паўд.-зах. кірунак і, сустракаючы больш халоднае кантынентальнае паветра, утварае цыклоны. Паўд.-зах. перанос у цыклонах робіць уплыў на надвор'е б. ч. Еўропы, у т. л. і Беларусі.

ІСЛА́НДСКІ ШПАТ, мінерал, празрыстая разнавіднасць *кальцыту*. Двухпераламляльны. Выкарыст. на выраб аптычных прылад.

ІСЛА́НДЫЯ (Island), Рэспубліка Ісландыя, дзяржава на аднайменным в-ве ў Атлантычным ак. на ПнЗ ад Еўропы. Пл. 103 тыс. *км*², нас. 204 тыс. чал. (1970). Сталіца Рэйк'явік. Краіна падзяляецца на 23 акругі (сіслы). І.— парламентарная рэспубліка. Дзейнічае канстытуцыя 1944. На чале дзяржавы прэзідэнт (выбіраецца на 4 гады). Вышэйшы орган улады — альцінг (парламент), выбіраецца на 4 гады. Урад узначальвае прэм'ер-міністр.



Прырода. Большая частка в-ва — плато выш. 400—800 *м* над узр. м. з шматлікімі вулканамі. Найвыш. пункт І.— вулкан Хванадальсхнукур (2119 *м*). Шмат гейзераў, гарачых крыніц. Ёсць торф, буд. матэрыялы. Клімат субарктычны, марскі. Сярэдняя т-ра студз. ў Рэйк'явіку −0,6, ліп. 11,1 °С. Ападкаў за год ад 465 *мм* на Пн да 2000—4000 *мм* на Пд. Ледавікі (пераважна на Пд) займаюць 11,4% тэр. краіны. Рэкі маюць значныя запасы гідраэнергіі. Глебы і расліннасць тундравыя. Жывёльны свет: пясцы, лемінгі, шмат птушак, мора багата на рыбу.



Ісландыя. Гейзеры ў наваколлі возера Міватн.



Рэйк'явік. Агульны выгляд.

Насельніцтва. Каля 99% — ісландцы. Дзярж. мова ісландская, рэлігія лютэранская. ²/₃ насельніцтва жывуць у гарадах і пасёлках на ўзбярэжжы. Найб. гарады (тыс. ж.): Рэйк'явік — 81,6 (1970), Акурэйры — 10 (1968).

Гістарычны нарыс. І. заселена ў 9—10 ст. выхадцамі з Нарвегіі, Шатландыі, Ірландыі. З пачатку засялення ўстанавілася сістэма народаўладдзя. У 930 створаны альцінг (нар. сход), найвышэйшы заканадаўчы і судовы орган. Афіц. рэлігіяй з 1000 стала хрысціянства. У гэты час ісл. мараплаўцы дасягнулі берагоў Грэнландыі і Паўн. Амерыкі, падтрымлівалі гандл. сувязі з народамі Еўропы і ўсх. славянамі, у прыватнасці з Ноўгарадам і Кіеўскай Руссю ў 9—11 ст. У 11—12 ст. у І. складваліся феад. адносіны. У 2-й пал. 13 ст. (1262—64) І. падпарадкавана нарв. феад. дзяржаве. З 1380 І. з Нарвегіяй пад уладай Даніі. Панаванне Даніі, якое вызначалася самавольствам дацкіх чыноўнікаў і рабаваннем в-ва, спусташала І. У 1800 урад Даніі ліквідаваў ісл. альцінг. Уздым нац.-вызв. руху ў І. (паўстанне 1809 супраць дацкага панавання), аслабленне Даніі пасля напалеонаўскіх войнаў, рост бурж.-дэмакр. руху ў самой Даніі вымусілі дацкі ўрад пайсці на ўступкі. У 1843 адноўлены альцінг (з дарадчымі функцыямі), у 1854 скасавана гандл. манаполія дацкіх купцоў. У 1855 выдадзены закон пра свабоду друку, у 1859 прызнана роўнасць ісл. і дацкай моў у дзярж. справаводстве, у 1872 адноўлена мясцовае самакіраванне, у 1874 — заканадаўчая ўлада альцінга (з каралеўскім правам абс. вета). Развіццё капіталізму ў І. ў канцы 19 — пач. 20 ст. ўзмацніла нац.-вызв. рух. У 1897 узнікла бурж. Партыя незалежнасці (кансерватыўная, аб'яднала пераважна рыбапрамыслоўцаў і гандл. буржуазію). У 1916 аформіліся Прагрэсіўная і С.-д. партыі, узнікла Федэрацыя ісл. прафсаюзаў. У выніку вызв. барацьбы ісл. народа, якая ўзмацнілася пад уздзеяннем Вял. Кастр. сацыяліст. рэвалюцыі, Данія вымушана была ў 1918 прызнаць І. суверэннай дзяржавай на аснове уніі (адзіны кароль, кіраванне Даніі замежнымі справамі, пастаянны нейтралітэт І.). 18.5.1920 прынята канстытуцыя І. (заканадаўчая ўлада альцінга і кантроль над дзейнасцю ісл. ўрада, які назначаўся каралём Даніі). Сусв. эканам. крызіс 1929—33 згубна адбіўся на І., выклікаў поўную дэзарганізацыю эканам. жыцця. У 1930 створана Камуніст. партыя І. (КПІ). У 1938 КПІ аб'ядналася з левым крылом С.-д. партыі, утварыўшы Адзіную сацыялістычную партыю І. (АСПІ). У 2-ю сусв. вайну ў І. з мая 1940 да ліп. 1941 былі англ. войскі. У ліп. 1941 на змену ім прыбылі амер. вайск. часці. У маі 1944 у рэферэндуме ў сувязі з заканчэннем тэрміну уніі з Даніяй ісл. народ выказаўся за яе ліквідацыю. 17.6.1944 абвешчана рэспубліка. СССР адзін з першых прызнаў незалежнасць І. (дыпламат. адносіны з 1943). Пасля 2-й сусв. вайны І. ўцягнута ў сістэму *Маршала плана* (1948) і НАТО (1949). У 1951 ёй навязана т. зв. пагадненне з ЗША «пра абарону», паводле якога ЗША маюць ваен. базы ў І. Вял. забастоўкі ў маі 1951 і ў снеж. 1952 мелі эканам. і паліт. характар. У маі 1957 альцінг пад націскам прац.



мас прыняў законы пра абмежаванне дзейнасці манаполій. У канцы 50 — пач. 60-х г. правячыя колы І. ўзмацнілі наступ на жыццёвы ўзровень працоўных, вынікам чаго была новая хваля забастовак і прац. канфліктаў. У пач. ліст. 1968 Народны саюз (блок АСПІ і левых сацыял-дэмакратаў) стаў паліт. партыяй. АСПІ самараспусцілася (снеж. 1968). Рабочы клас, прац. сялянства, прагрэс. інтэлігенцыя змагаюцца за дэмакр. сацыяльныя пераўтварэнні, за палітыку пастаяннага нейтралітэту, за выхад І. з НАТО, за вывад з яе тэр. амер. войск. На выбарах 13.6.1971 большасць ісландцаў галасавала за прадстаўнікоў трохпартыйнай левацэнтрысцкай кааліцыі (у яе ўвайшлі Прагрэсіўная партыя, Народны саюз і Арганізацыя вальнадумных і левых). Новы ўрад узначаліў старшыня Прагрэсіўнай партыі О. Йоханесан. І.— чл. ААН з 1946.

Гаспадарка. Асн. галіны — рыбалоўства і рыбаапрацоўка, манапалізаваны некалькімі капіталіст. аб'яднаннямі. Улоў рыбы ў 1970 склаў 720 тыс. *т*. Ловяць селядцоў і траску, пераважна ў прыбярэжных водах на З і Пн. Цэнтры рыбаапрацоўкі: раён Рэйк'явіка; Акурэйры, Ісафіёрдур. У 1969 выпрацавана 700 млн. *квт·гадз* эл. энергіі. Ф-ка азотных угнаенняў (Рэйк'явік), цэментавы з-д (Акранес), алюмініевы з-д (Хабнарфіёрдур, яго буд-ва фінансуецца замежным капіталам). Есць аўтарамонтны (Рэйк'явік), электраматорны (Акурэйры), электраапаратуры (Хабнарфіёрдур) з-ды; малочныя з-ды і мясакамбінаты, тэкст. прадпрыемствы і буд-ва невялікіх суднаў (Рэйк'явік, Акурэйры). У Рэйк'явіку невялікія прадпр. лёгкай і харч. прамысловасці. С. гасп. жывёлагадоўчага кірунку. У 1970 было (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 53 (у т. л. кароў 36), авечак 781. Каля 1 тыс. *га* занята агароднінай. Транспарт марскі і аўтамабільны (даўж. аўтадарог 10,7 тыс. *км*). Гал. транспартны цэнтр Рэйк'явік. У Кеблавіку міжнар. аэрапорт і амер. ваен. база. І. вывозіць рыбу і рыбапрадукты (95% экспарту па кошце), прывозіць машыны і абсталяванне, паліва, харч. тавары. Гандаль з краінамі Зах. Еўропы, ЗША, СССР. Грашовая адзінка — ісландская крона.

Асвета, навуковыя ўстановы. Уведзена абавязковае навучанне для дзяцей 7—15(16) гадоў. Сярэдняя школа 7-гадовая (малодшая ступень 3 гады, старэйшая — 4 гады). Паколькі краіна рэдканаселеная, у сельскай мясцовасці працуюць т. зв. перасоўныя школы. У 1967/68 навуч. г. ў абавязковых школах навучалася 27,5 тыс. дзяцей, у малодшых сярэдніх школах 12,8 тыс. навучэнцаў, у старэйшых сярэдніх школах (гімназіях) 1950 чал. Права паступаць ва ун-т даюць толькі гімназіі. ВНУ: ун-т у Рэйк'явіку. Б-кі: Нац. б-ка ў Рэйк'явіку, б-ка ун-та. У Рэйк'явіку Нац. музей Ісландыі, маст. галерэя, музей прыродазнаўчай гісторыі, Нац. даследчы савет, універсітэцкі даследчы ін-т, універсітэцкі ін-т паталогіі і бактэрыялогіі, метэаралагічны ін-т, адукацыйны савет, ісландская лабараторыя рыбалоўства.

Літаратура. Фальклор збярогся ў запісах 13 ст. (аб. міфалагічных і гераічных песень «Эда Старэйшая», вершы стараж. ісл. паэтаў — скальдаў). У 9—13 ст. пашырыліся эпічныя творы ў прозе — сагі: т. зв. родавыя (пра ісл. першапасяленцаў) і каралеўскія (з гісторыі Нарвегіі да сярэдзіны 13 ст.). У 13 ст. Сноры Стурлусан напісаў каралеўскую сагу «Хеймскрынгла» і трактат пра язычніцкую міфалогію і паэзію скальдаў «Эда Малодшая». Асн. жанр л-ры да 19 ст.— рымы (вершаваныя пераказы складаных фантаст. сюжэтаў). Панаванне Нарвегіі і Даніі ў І. прывяло да заняпаду ісл. л-ры, якая пачала адраджацца ў 19 ст., калі гал. плынню зрабіўся рамантызм (паэты Б. Торарэнсен, І. І. Хадльгрымсан, М. Іохумсан, Г. Томсен і інш.). Рэалізм, які ўзнік у 80-я г. 19 ст. (Г. Паўльсан), развіваўся на пач. 20 ст. ў драмах І. Сігур'яўнсана, вершах Т. Эрлінгсана, Э. Бенедыхтсана. Гісторыя І. адлюстравана ў раманах Г. Гунарсана, К. Гвудмундсана, Г. Камбана, Г. Хагаліна і інш. Крызіс капіталіст. грамадства паказаны ў творах Т. Тоўрдарсана. У творчасці прадстаўніка сацыяліст. рэалізму Х. К. *Лакснеса* вострая крытыка бурж. рэчаіснасці спалучаецца з глыбокім псіхалагізмам.

Літ.: Серебрянный Л. Р. Исландия, М., 1969; Бенедиктссон Г. Исландия в борьбе за независимость (1940—1955), пер. с исл., М., 1958; Кущ П. Внешняя политика Исландии, М., 1963; Кристьянссон С. Великая Октябрьская социалистическая революция и Исландия, пер. с дат., М., 1957; Ольгейрссон Э. Из прошлого исландского народа, пер. с исл., М., 1957; Андрессон К. Е. Современная исландская литература. 1918—1948, пер. с исл., М., 1957; Стеблин-Каменский М. И. Культура Исландии, Л., 1967.

І. Я. Афнагель (прырода, гаспадарка). Мінск; *У. З. Клепікаў* (асвета). Масква.

ІСО́П (Hyssopus), род шматгадовых травяністых раслін або паўкустоў сям. губакветных. Вядома 15 відаў, пашыраных у Паўд. Еўропе, Паўн. Афрыцы і Азіі. У СССР 9 відаў, на Беларусі 1 культурны від — І. лекавы (H. officinalis, нар. назвы: красвень, красвяк, крузбень).



Ісоп лекавы.

Паўкуст, выш. 20—60(80) *см*. Лісце лінейна-ланцэтнае цэласнакрайняе. Кветкі сінія, радзей ружовыя ці белыя, сабраныя ў несапраўдныя аднабаковыя каласы. Плод — арэшак. Расліны з моцным бальзамічным пахам (маюць дубільныя рэчывы і эфірны алей, які ўжываецца ў парфумернай і лікёра-гарэлачнай вытворчасці). Вырошчваецца як лекавая і дэкаратыўная расліна.

Літ.: Гл. пры арт. *Лекавыя расліны*.

ІСПА́НА-АМЕРЫКА́НСКАЯ ВАЙНА́ 1898, першая імперыялістычная вайна за перадзел свету. Распачата амер. імперыялістамі, каб

падзяліць ісп. калоніі ў Амерыцы і Азіі. Паводле вызначэння У. І. Леніна, была адной з гал. вехаў новай эпохі сусв. гісторыі, азначала пачатак імперыялізму (гл. Ленін У. І. Тв., т. 23, с. 95).

У лют. 1898 на рэйдзе порта Гавана (Куба) узарваўся амер. ваен. карабель «Мэн». Урад ЗША выкарыстаў гэта, абвінаваціў у дыверсіі Іспанію і 21 крас. пачаў супраць яе ваен. дзеянні. Адсталая ў ваен. і эканам. адносінах Іспанія была пераможана. Паводле Парыжскага мірнага дагавору 1898 ісп. калонія Куба фармальна абвешчана незалежнай, фактычна стала калоніяй ЗША. Да ЗША адышлі Філіпіны, дзе амер. імперыялісты задушылі нац.-вызв. рух (гл. *Амерыкана-філіпінская вайна 1899—1901*), а-вы Пуэрта-Рыка, Гуам і інш. У выніку І.-а. в. ЗША набылі важныя стратэгічныя пункты, што спрыяла ўзмацненню амер. экспансіі ў Лац. Амерыцы і на Д. Усходзе.

Літ.: Ленін У. І. Імперыялізм і раскол сацыялізма, Тв., т. 23 (Полн. собр. соч., т. 30); яго ж. Сацыялізм і вайна, Тв., т. 21 (там жа, т. 26); Владимиров Л. С. Дипломатия США в период американо-испанской войны 1898 г., М., 1957; Слезкин Л. Ю. Испано-американская война 1898 года, М., 1956.

ІСПА́НІЯ (España), краіна на ПдЗ Еўропы, на Пірэнейскім п-ве; уключае Балеарскія астравы ў Міжземным м. і Канарскія астравы ў Атлантычным ак. На Пн абмываецца Біскайскім залівам, на ПдЗ непасрэдна Атлантычным ак. і на ПдУ і У — Міжземным морам. Пл. 505 тыс. *км²*. Нас. 33 млн. чал. (1971). Сталіца Мадрыд. Краіна падзяляецца на 50 правінцый. І. валодае *Сахарай Заходняй*, раёнамі гарадоў Сеута і Мелілья на ўзбярэжжы Марока. [На ўклейках: каляровая карта, іл. да раздзелаў Прырода, Гасп., Гістар. нарыс (I), Архітэктура, Выяўл. маст. (II)].





Жыллё беднякоў недалёка ад цэнтра Мадрыда.

Дзяржаўны лад. Законам 1947 І. абвешчана манархіяй. Устанаўленне каралеўскай улады адкладзена да адыходу Ф. Франка ад паліт. жыцця. Адзінай канстытуцыі няма. Дзейнічае Арганічны закон дзяржавы 1966 і канстытуцыйныя акты (асноўныя законы) 1938, 1942, 1945, 1947, 1957, 1959. З 1939 у краіне дыктатура фашысцкага тыпу. Дзяржаву і ўрад (савет міністраў) пажыццёва ўзначальвае Франка. Заканадаўча-дарадчы орган — картэсы (аднапалатны парламент). Нязначная частка дэпутатаў выбіраецца, астатнія назначаюцца Франка ці ўваходзяць у склад картэсаў па пасадах (міністры, саноўнікі царквы, чыны арміі, флоту і інш.) ці дэлегуюцца правячай партыяй і афіц. прафсаюзамі.

Узбярэжжа Біскайскага заліва каля Сан-Себасцьяна.



Прырода. І.— гарыстая краіна. Амаль ²/₃ тэр. вышэй як 500 *м* над узр. м. Цэнтр. частку займае стараж., моцна разбуранае пласкагор'е Месета, прыўзнятае па краях. Яно акаймавана маладымі гарамі: на Пн Кантабрыйскімі, на ПнУ Іберыйскімі, на Пд Кардыльерай Бетыка і Андалузскімі з найвыш. вяршыняй І.— г. Муласен (3478 *м*). Цэнтральная Кардыльера (выш. да 2592 *м*) дзеліць Месету на 2 часткі: паўн.— Стара-Кастыльскае пласкагор'е, паўд.— Нова-Кастыльскае пласкагор'е. На ПнУ краіны г. Пірэнеі (выш. да 3404 *м*), Каталонскія горы. Паміж Пірэнеямі, Іберыйскімі і Каталонскімі гарамі — Арагонская раўніна, на ПдЗ — Андалузская нізіна. Карысныя выкапні: ртуць, цынк, каменны і буры вугаль, жалезныя, вальфрамавыя, медныя, хромавыя і уранавыя руды, пірыты, фасфарыты, калійная і спажыўная соль, сера, гаручыя сланцы. Клімат на пласкагор'і кантынентальны, сухі, з гарачым летам і параўнальна халоднай зімою. На Пн і ПнЗ — умераны, блізкі да марскога, на Пд, ПдЗ і У — міжземнаморскі. Сярэдняя т-ра студз. ад 8,4 на Пн да 12,3 °С на Пд, жн. ад 18—20 на Пн да 26 °С на Пд. Ападкаў 350—500 *мм* за год; на Пд і ва ўсх. раёнах месцамі менш за 200 *мм*, на ПнЗ 900—1000 *мм*, у гарах 1500—2000 *мм*. Рачная сетка густая, але рэкі малаводныя, летам мялеюць, парожыстыя. Найб. значныя: Таха, Дуэра, Эбра і Гвадалквівір. Выкарыстоўваюцца на арашэнне і для буд-ва ГЭС. На Пн і ПнЗ пашыраны вільготныя лясныя буразёмы пад шыракалістымі лясамі; у гарах да 1800—2000 *м* — букавыя і хваёвыя лясы на горна-лясных глебах. На пласкагор'і Месета і на Арагонскай раўніне — сухія буразёмы, чырваназёмы, якія месцамі зменьваюцца паўпустыннымі глебамі з участкамі саланчакоў. Расліннасць ксерафітнага тыпу з перавагаю хмызнякоў і паўхмызнякоў. Прыморскія нізіны і рачныя даліны маюць урадлівыя алювіяльныя глебы. Лясы знішчаны, займаюць усяго каля 10% тэр. Прамысл. значэнне мае кара коркавага дубу, па зборы якой І. займае 2-е месца ў свеце (пасля Партугаліі). З жывёл характэрныя: ліс, барсук, пардавая рысь, воўк, пірэнейскі мядзведзь, каменны казёл, генета, алжырскі вожык і інш. У краіне 2 нац. паркі і 2 запаведнікі агульнай пл. 730 *км²*.

Насельніцтва. Большасць (66%) — іспанцы; каля 20% каталонцаў (Каталонія і Балеарскія а-вы), каля 10% галісійцаў і на Пн 4% баскаў — самага стараж. насельніцтва краіны.

Дзярж. мова — іспанская, большасць верующых — католікі. Сярэдняя шчыльн. нас. 65,3 чал. на 1 км², найб. густа заселены прыморскія раёны. З-за нізкага ўзроўню жыцця і беспрацоўя штогод пакідаюць І. ў сярэднім 200 тыс. чал. Гарадскога нас. больш за 50%. Вял. гарады (тыс. ж., 1970): Мадрыд (3000), Барселона (1900), Валенсія (700) і Севілья (550).

Гістарычны нарыс. Паводле археал. звестак тэр. І. населена з часоў ніжняга палеаліту. У 2-м тысячагоддзі да н. э. карэннае насельніцтва ведала меднарудную і бронзаліцейную вытворчасць, займалася земляробствам і жывёлагадоўляй. Багатыя на жалеза, медзь і серабро землі вабілі заваёўнікаў. У 9—8 ст. да н. э. на тэрыторыі І. стварылі свае калоніі фінікійцы. Адначасова пачалося ўварванне кельтаў, у 7—6 ст. грэкаў, з 6 ст. карфагенян. З 206 да н. э. на працягу 2 стагоддзяў тэр. І. заваёўвалі рымляне. У часы іх панавання сталі пераважаць рабаўладальніцкія адносіны. У 3—7 ст. н. э. латыфундыі ператвараюцца ў феад. маёнткі. У выніку нашэсця ў 3—5 ст. варвараў на большай частцы тэр. І. ўтварылася каралеўства вестготаў. У 711—718 амаль усю тэр. Пірэнейскага п-ва завалявалі арабы і стварылі халіфат. Па-за межамі яго асталася ў 8 ст. толькі паўн. частка тэр. І., дзе ўтварылася іспан.-вестготскае каралеўства Астурыя. У 9 ст. на ПпУ узнікла Наварскае каралеўства. У канцы 8 — пач. 9 ст. франкі адваявалі ў арабаў Каталонію, у 865 вызваленыя франкамі землі вылучыліся ў Іспанскую марку, у якую ўвайшло 7 графстваў. На канец 9 ст. яны сталі фактычна незалежнымі феад. дзяржавамі. У 11 ст. халіфат распаўся на дробныя феад. дзяржавы. Гэта памагло народам Пірэнейскага п-ва адваяваць захопленыя арабамі тэрыторыі. Шматвяковая барацьба за вызваленне ад арабскага панавання (рэканкіста, закончана ў 1492) вызначыла своеасаблівасць развіцця І. Сляне некат. абласцей дамагліся аслаблення прыгоннай залежнасці, гарады — шырокага самакіравання і вольнасцей, рыцарства і феад. вярхі атрымалі маёнткі арабаў, духавенства захапіла большую частку арабскіх земляў і стала значнай паліт. сілай у І. Умацавалася каралеўская ўлада.

Пасля адкрыцця ў 1492 Х. Калумбам Амерыкі іспанцы захапілі (1-я пал. 16 ст.) Мексіку, Перу, Балівію, Чылі, частку Аргенціны і інш. тэр. ў Цэнтр. і Паўд. Амерыцы. Калан. ўладанні расшыраліся і за кошт тэр. ў Еўропе (завяванне ў 1512 Верхняй Навары, далучэнне ў 1516 Нідэрландаў), пазней у Афрыцы. У 1519 іспан. кароль Карл I стаў імператарам «Свяшчэннай Рымскай імперыі» пад імем Карла V. У 1516—1600 І.— магутная ў ваен. і паліт. адносінах краіна ў Еўропе. Але яе эканоміка грунтавалася пераважна на даходах з калоній, была няўстойлівая. Каралеўская ўлада не спрыяла развіццю ўнутр. вытворчасці і гандлю. Заняпад іх паскорыла *інквізіцыя*. Пасля гібелі іспан. флоту ў вайне 1588 з Англіяй І. страціла панаванне на моры. Пасля Нідэрландскай бурж. рэвалюцыі 16 ст. ад І. аддзяліліся Паўн. Нідэрланды. У выніку шматлікіх войнаў 17 ст. значная частка іспан. уладанняў у Еўропе адышла да Англіі, Галандыі і Францыі. Вял. ваен. выдаткі абядналі краіну. Пасля смерці караля Карла II [1665—1700] пачалася вайна за іспан. спадчыну (1701—14), якая скончылася ўсталяваннем у І. улады дынастыі *Бурбонаў* і падзелам іспан. уладанняў у Еўропе паміж Аўстрыяй, Савояй і Англіяй. У пач. 18 ст. І. была адсталай краінай, пераважала цэхавае вытворчасць у 2-й пал. 18 ст. Рэформы *асветнага абсалютызму* не ліквідавалі адставання эканомікі. У перыяд Франц. бурж. рэвалюцыі канца 18 ст. І. ваявала (1793—95) супраць Францыі. Базельскі мір 1795 і дагавор пра франка-іспан. абарончы і наступальны саюз 1796 ператварылі І. ў паслухмяную зброю франц. знешняй палітыкі. Паводле франка-іспан. дагавору 1807 пра завалванне і падзел Партугаліі франц. войскі ўвайшлі на тэр. І. У 1808 пачалася франц. агрэсія супраць І. Яна выклікала магутны нац.-вызв. рух, а'явілася штуршком да першай іспан. бурж. рэвалюцыі 1808—14. У час яе іспан. народ абараніў сваю незалежнасць. Другая мэта рэвалюцыі — ліквідацыя феадалізму не была дасягнута. У краіне не спыняліся выступленні супраць феад.-абсалютысцкага рэжыму. Яны вылілісяў другую бурж. рэвалюцыю 1820—23. Кароль мусіў даць прысягу прагрэс. канстытуцыі 1812. Але з-за пазіцыі левых ліберałаў закон 1821 аб ліквідацыі феад. права памешчыкаў на зямлю не быў ажыццёўлены. У 1823 паводле рашэння *Свяшчэннага саюза* ў І. ўвайшлі франц. войскі. З іх дапамогаю рэвалюцыя была задушана. У выніку *вайны за незалежнасць іспанскіх калоній у Амерыцы 1810—26* І. страціла на амер. кантыненце ўсе калоніі, акрамя Кубы і Пуэрта-Рыка. Супярэчнасці, выкліканыя развіццём капіталіст. адносін, прывялі да трэцяй бурж. рэвалюцыі 1834—43. Буржуазія дамаглася поўных устойлівых заваёў: знішчэнне інквізіцыі, *майрату* і інш. У 1837 прынята новая канстытуцыя. У 40-я г. 19 ст. пачаўся прамысл. пераварот, павялічылася колькасць фабрычных рабочых, узніклі рабочыя арг-цыі. Рабочы клас актыўна ўдзельнічаў у чацвёртай бурж. рэвалюцыі 1854—56, але не выступаў яшчэ як самастойная паліт. сіла, толькі падтрымліваў радыкальнае крыло буржуазіі. У 1855 упершыню ў гісторыі І. праведзена ўсеаг. забастоўка. Нарасталі выступленні за рэспубліку. У 1857, 1861 і 1863 адбыліся сялянскія хваляванні. У 1868 пачалася пятая бурж. рэвалюцыя. У час яе ўзніклі новыя рабочыя арг-цыі, у снеж. 1868 засн. першая іспан. група, а ў 1870 — Іспан. федэрацыя 1-га Інтэрнацыянала. У 1869 прынята канстытуцыя, у лютым 1873 І. абвешчана рэспублікай. У снеж. 1874 у выніку пераварота ў І. адноўлена бурбонская манархія і ўстаноўлены кансерватыўна-канстытуцыйны рэжым. У канцы 70-х г. 19 ст. актывізавалася барацьба рабочага класа. Створана (1879) Іспан. сацыяліст. рабочая партыя (ІСРП), у 1888 — Усеаг. саюз працоўных (УСП). Разгарнуўся нац.-вызв. рух у іспан. калоніях, дзе эканам. ўплыў І. слабеў з-за пранікнення амер. капіталу. У выніку *іспана-амерыканскай вайны 1898* І. страціла Кубу, Пуэрта-Рыка, Філіпінскія а-вы і в-аў Гуам. у 1899 мусіла прадаць Германіі Каралінскія, Марыянскія і Палаў а-вы. Ад велізарнай іспан. калан. імперыі асталіся толькі нязначныя тэр. ў Афрыцы.

У 1-ю сусв. вайну І. захоўвала нейтралітэт. Іспан. буржуазія нажывалася на пастаўках вугалю і амуніцыі. Пагоршыліся ўмовы жыцця рабочага класа. Яго барацьба за свае правы асабліва актывізавалася пад уплывам Вял. Кастр. сацыяліст. рэвалюцыі. У 1920 засн. *Камуністычная партыя Іспаніі* (КПІ). У 1921 іспан. калан. войскі былі пераможаны ў Марока (войны за завалванне гэтай краіны І. вялі ў сярэдзіне 19 ст. і 1-й трэці 20 ст.). Гэта выклікала повы ўздым рэвалюц. і антыманархічнага руху ў І. Каб папярэдзіць рэвалюцыю, рэакц. колы пайшлі на дзярж. пераварот. У час ваеннай дыктатуры ген. Прыма дэ Рывера [1923—30] былі распушчаны картэсы (прадстаўнічыя сходы) і муніцыпалітэты, забаронены паліт. партыі. Рэакц. палітыка паглыбіла класавыя супярэчнасці, абвастрыла паліт. барацьбу. У 1930 Прыма дэ Рывера мусіў пайсці ў адстаўку. Створаны ў жн. 1930 Рэвалюц. к-т абвясціў 14.4.1931 І. рэспублікай. Пачалася шостая, бурж.-дэмакр. іспан. рэв. (гл. *Іспанская рэвалюцыя 1931—39*), якая ў 1936—39 набыла характар нац.-рэвалюц. вайны супраць іспан. і міжнар. фашызму. У арганізацыі рэвалюц. барацьбы іспан. народа важная роля належала КПІ, яе дзеячам Х. *Дыясу*, Д. *Ібруры* і інш. На франтах за Іспан. рэспубліку змагаліся тысячы добраахвотнікаў-антыфашыстаў з 54 краін (гл. *Інтэрнацыянальныя брыгады*). У першых радах сусв. руху салідарнасці з іспан. народам былі працоўныя СССР. У І. ўсталявалася рэспубліка новага















Іспанія I.

1. Горы Пірэнеі.
2. Більбао. Порт і сталеліцейныя заводы.
3. Мадрыд. Плошча Аточа.
4. Барселона. Порт.
5. Віга. Рабочы квартал.
6. Выступленне студэнтаў Мадрыда супраць рэжыму Франка. Дэманстранты блакіруюць адну з вуліц.
7. Апрацоўка глебы ў іспанскай вёсцы.









Іспанія II.

1. Наскальная выява бізона ў пячоры Альтаміра (правінцыя Сантандэр). Палеаліт.
2. Інтэр'ер мячэці (цяпер сабора) у Кордаве. 8–10 ст.
3. Палац герцагаў Інфантада ў Гвадалахары. Каля 1480—93. Будаўнікі Х. Гуас, Эгуаоміт і інш.
4. Х. Б. дэ Таледа, Х. Б. дэ Эрэра. Эскарыял. 1563—84.
5. Э. Тароха і інш. Іпадром Сарсуэла ў Мадрыдзе. 1936.
6. Эль Грэка. Пахаванне графа Оргаса. 1586—88. Царква Санта-Томе. Таледа.
7. Д. Веласкес. Меніны. 1656. Прадо. Мадрыд.
8. Ф. Гоя. Тут нічога нельга было зрабіць. Афорт. 1793—97. З серыі «Капрычас».









тыпу — без памешчыкаў, буйной буржуазіі і ваеншчыны. Іспр. рэспубліка з'явілася правобразам нар.-дэмакр. дзяржавы. У выніку фаш. мяцяжу і германа-італьян. інтэрвенцыі, якой фактычна спрыялі сваёй палітыкай Вялікабрытанія, Францыя і ЗША, рэспубліка была пераможана. У краіне ўсталявалася фаш. дыктатура ген. Франка, улада найб. рэакц. груп зямельнай і фін. алігархіі. Усе партыі, акрамя фаш. «Іспр. фаланга» (з 1958 «Нац. рух»), забаронены, ліквідаваны дэмакр. свабоды.

У 2-ю сусв. вайну І. абвясціла сябе нейтральнай (вер. 1939), а потым краінай, якая не ваюе (чэрв. 1940), але пастаўляла Германіі і Італіі стратэг. сыравіну, аддала на карыстанне герм. флоту і авіяцыі свае ваен. базы, накіравала на сав.-герм. фронт «Блакітную дывізію» (20 тыс. чал.). У вайну ў І. актывізаваўся партыз. рух (пачаўся пасля ўсталявання дыктатуры Франка, спынены ў 1948 паводле рашэння КПІ, які распрацавала новую тактыку барацьбы: выкарыстанне побач з нелегальнай работай легальных магчымасцей). У 1947 франкісцкая І. абвешчана манархіяй, а Франка пажыццёвым кіраўніком дзяржавы. Іспана-амер. дагавор 1953, адпаведна з якім на тэр. І. пабудаваны амер. ваен. базы, спрыяў знешнепаліт. залежнасці І. ад ЗША. У 1959 іспр. ўрад паводле пагаднення з ЗША прыняў «План стабілізацыі эканомікі». Вырасла роля манапалій, фін. капіталу, асабліва дзярж.-манапалістычнага.

Пасля часовага спаду (1947—50) пачаўся ўздым антыфранкісцкага руху. КПІ выступіла за стварэнне Нац. антыфранкісцкага фронту на аснове «палітыкі нац. згоды». 5.5.1958 КПІ правяла Дзень нац. згоды — арганізаванае агульнанац. выступленне супраць франкісцкага рэжыму. На прадпрыемствах пачалі стварацца незалежныя ад афіц., т. зв. вертыкальных прафсаюзаў, рабочыя камісіі, у якія ўваходзяць працоўныя розных паліт. поглядаў. Рабочыя камісіі сталі своеасаблівай формай адзінага рабочага фронту. У агульнанац. маштабе яны патрабуюць структурных рэформаў (дэмакратызацыя грамадскага жыцця, агр. рэформа, нацыяналізацыя банкаў і г. д.). Вярх. трыбунал абвясціў рабочыя камісіі «незаконнымі асацыяцыямі». Аднак гаценні, тэрор не спыняюць забастовачнага і антыфранкісцкага дэмакр. руху. Пераломнае значэнне для яго мела стачка гарнякоў 1962 у Астурыі, якая перарасла ў забастовачнае выступленне 24 правінцый. У 1968 адбылося 567 забастовак, у 1970 — масавыя стачкі гарнякоў у Астурыі, с.-г. рабочых у Андалузіі і інш. У многіх месцах створаны сялянскія камісіі, якія выступаюць супраць памешчыкаў і манаполій. Актывізаваўся рух баскаў і каталонцаў за нац. аўтаномію, студэнцкі рух за дэмакратызацыю сістэмы навучання і свабодныя студэнцкія прафсаюзы. Урад мусіў дазволіць студэнцкія саюзы (з агаворкай, што яны не павінны быць палітычныя). Побач з нязначнымі ўступкамі ўрад узмацніў паліцэйскія рэпрэсіі супраць працоўных і студэнцтва. У 1969 у краіне ўведзена надзвычайнае становішча, што выклікала новую хвалю антыфранкісцкіх выступленняў, руху за паліт. правы працоўных. Апазіцыя палітыцы Франка мацнее і сярод духавенства. Канферэнцыя епіскапаў 1968 выказалася за свабоду прафсаюзаў і стачак. Крызіс ахапіў партыю «Нац. рух». Яе Нац. савет мусіў дазволіць у межах партыі дзейнасць напаўпалітычных асацыяцый, пры ўмове, што яны будуць лаяльныя да прынцыпаў рэжыму. У 1969 рэарганізаваны ўрад. У ім фалангістаў замянілі дзеячы з каталіцкай арг-цыі «Опус дэі», выразніцы неакапіталіст. колаў. Паводле Арганічнага закону 1966 праводзяцца павярхоўныя перабудовы: падзел функцый кіраўніка дзяржавы і ўрада (абедзве раней ажыццяўляліся Франка), прамыя выбары 104-х (з 564) дэпутатаў парламента. У 1969 картэсы зацвердзілі пераемнікам Франка прынца Хуана Карласа, які павінен будзе стаць каралём І. КПІ выступае супраць усякага рашэння пра будучыню краіны, навязаную рэжымам Франка.

Працоўныя Мадрыда патрабуюць амністыі палітзняволеным. 1970.



З 1955 І.— член ААН. На міжнар. арэне супрацоўнічае з краінамі Арг-цыі паўночнаатлантычнага дагавору (НАТО), намагаецца ўступіць у «Агульны рынак». Пасля выхаду Францыі з НАТО (1966) вырасла роля І. ў стратэгічных планах ЗША, якія датычаць раёна Міжземнамор'я. Нац.-вызв. рух падарваў калан. пазіцыі І. У 1956 яна адмовілася ад пратэктарату над іспр. зонай Марока (устаноўлены паводле франка-мараканскага і франка-іспр. дагавораў 1912), у 1969 перадала Марока тэрыторыю Іфні. У снеж. 1968 абвешчана незалежнасць Экватарыяльнай Гвінеі.

Палітычныя партыі і прафсаюзы. Іспанская фаланга традыцыяналістаў і хунтаў нацыянал-сіндыкалісцкага наступлення («Нацыянальны рух»). Франкісцкая, адзіная легальная партыя ў І. Створана на базе заснаванай у 1933 «Іспр. фалангі». Іспанская сацыялістычная рабочая партыя. Засн. ў 1879, з 1939 на нелегальным становішчы. Уваходзіць у Сацыяліст. Інтэрнацыянал. *Камуністычная партыя Іспаніі.* Засн. ў 1920, з 1939 у падполлі. Старшыня Д. Ібаруры. Ген. сакратар. С. Карыльё. Іспанская прафсаюзная арганізацыя. Засн. ў 1940. Аб'ядноўвае вертыкальныя прафсаюзы, у якія ўваходзяць прадпрыемцы, інжынерна-тэхнічныя работнікі, рабочыя. Больш за 12 млн. членаў.

Гаспадарка. Эканоміка І. залежыць ад замежнага капіталу (пераважна ад ЗША, Вялі-



кабрытаніі, ФРГ і Швейцарыі). У эканам. жыцці І. вялікая ўлада дзярж.-манапаліст. аб'яднанняў. Манаполіі кантралююць 45% вытв. эл. энергіі, каля 80 чорных металаў, 75 цэменту, 70 шкла, 40 паперы, 75 цукру, 50 бавоўны і 100% вытв. нафты. 45% нац. даходу прыпадае на 1 млн. прадстаўнікоў пануючых класаў, а на 9 млн. працоўных — толькі 38%. Тэр. краіны шырока выкарыстоўваецца ў ваенна-стратэгічных мэтах, асабліва ЗША, якія пабудавалі ў І. шэраг ваенных баз. Доля прамысловасці ў нац. даходзе 34% (1970), у ёй занята 36,2% самадзейнага насельніцтва. Пераважаюць дробныя прадпрыемствы, толькі 10% прамысл. прадпрыемстваў налічваюць больш за 100 рабочых кожнае. Найб. важная і старая галіна прамысл.— горназдабыўная. У 1968 здабыта (тыс. *т*): кам. вугалю 12 322 і 2882 лігнітаў (прав. Леон, Аўеда, Кордава, лігніты ў паўн.-ўсх. раёнах); жал. руды 5976 (прав. Біская, Гранада, Леон, Тэруэль, Сантандэр, Альмерыя, Луга і Аўеда); ртутнай руды 1,9 (1-е месца ў свеце, прав. Сьюдад-Рэаль). Здабываюць марганцавыя (каля 80% у прав. Уэльва), медныя (Андалузія) і свінцовыя (прав. Хаэн, Мурсія і Сантандэр) руды, пірыт (3-е месца ў свеце), вальфрам, алавяныя і уранавыя руды (І. найбольшы ў Еўропе экспарцёр урану), калійную і спажыўную соль, золата, серабро. Агульная магутнасць эл. станцый 13,5 млн. *квт* (1969). У 1970 выпрацавана 40 млрд. *квт·гадз* эл. энергіі. Працуюць 2 АЭС. У 1970 выплаўлена 7,2 млн. *т* сталі і 2,5 млн. *т* чыгуну. Каляровая металургія ў 1970 дала (тыс. *т*): алюмінію (першаснага) 110,1, свінцу (першаснага) 69,6, медзі 84,0. Хім.



Іспанія. Сельскагаспадарчыя пасевы ў адной з далін Пірэнеяў.

прамысловасць (вытв. сернай, салянай і азотнай к-т, мінер. угнаенняў, ядахімікатаў і сінт. валокнаў) сканцэнтравана ў прыморскіх гарадах. У апошнія гады развіваецца нафтаперапр. і нафтахім. прамысловасць (на прывазной сыравіне). З-ды ў Эскамбрэрасе, Уэльве, Картахене, Барселоне, Мадрыдзе, Валенсіі. У 1970 выпрацавана 16,5 млн. *т* цэменту. Машынабудаванне і металаапрацоўка даюць 20% кошту прамысл. прадукцыі. Аўтазаводы (філіялы замежных фірмаў) у Мадрыдзе, Барселоне, Вальядалідзе, Віга. Суднабудаванне ў Більбао, Сантандэры, Кадысе, Картахене, Барселоне. Сярод галін лёгкай прамысл. найбольш развіты тэкст. (баваўняная і шарсцяная) і харчовая. Есць прадпрыемствы гарбарнай, швейнай, папяровай і дрэваапр. прамысловасці. У с. гасп. занята 27,5% самадзейнага насельніцтва, яна дае 20% нац. даходу. Характэрны перажыткі феад. адносін і буйное памешчыцкае землеўладанне. Больш як палова ворных зямель сканцэнтравана ў руках 1% землеўладальнікаў. 2,5 млн. сялян валодаюць участкамі да 5 *га*, каля 2 млн.— малазямельныя і беззямельныя. Шырока распаўсюджана кабальная арэнда. З сялян бяруць 42 віды падаткаў. Апрацоўваецца каля 20 млн. *га* зямлі, арашаецца каля 2 млн. *га* (1968). Па ўзроўні механізацыі і выкарыстанні мінер. угнаенняў І. на адным з апошніх месцаў у Еўропе. Збор галоўных с.-г. культур (тыс. *т*, 1970): пшаніцы 4060, ячменю 3092, аўса 402, жыта 256, кукурузы 1868, рысу 388, бавоўны 203, цукр. буракоў 5715. Вырошчваюць цыбулю, памідоры, баклажаны, якія часткова ідуць на экспарт. ¼ ворных зямель занята шматгадовымі пладовымі насаджэннямі: плантацыямі маслін, цытрусавых, вінограду. Па зборы маслін І. займае 1-е месца ў свеце, цытрусавых (мандарыны, апельсіны) — 2-е, а па экспарце 1-е; па зборы вінограду і па вытв. віна (25 млн. *гл*, 1970) — 3-е месца ў свеце. Вырошчваюць перац, абрыкосы, персікі, гранаты, інжыр, бананы, слівы, грушы. Жывёлагадоўля пашавага кірунку. Вылучаюць дзве галіны: авечкагадоўля (Месета) і гадоўля цяглавай жывёлы (мулаў, аслоў, коней), быкоў для карыды (Андалузія). У 1970 было (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 4288, свіней 6915, авечак 18 729 (2-е месца ў Еўропе), коней 285, мулаў 566 і аслоў 386. Важнае значэнне мае рыбалоўства і лясная гаспадарка (нарыхтоўка драўніны і коркавай кары). Даўж. чыг. 18 тыс. *км*, электрыфікавана каля 2 тыс. *км*, аўтамаб. дарог 140 тыс. *км*, асфальтавана каля 45 тыс. *км*. Гал. порты: Барселона, Більбао, Валенсія. Танаж гандл. флоту 4000 тыс. бр. рэг. *т* (1970). Значная галіна даходу І. замежны турызм (1,7 млрд. дол. у 1970). У 1968 экспарт склаў 1589 млн. дол., імпарт 3522 млн. дол. І. вывозіць апельсіны, масліны, аліўкавы алей, віно, памідоры, мінер. сыравіну (пірыт, цынкавую і вальфрамавую руды), машыны і абсталяванне, пластмасы, смолы, калійную соль; прывозіць кокс, металы, машыны, бавоўну. Асн. гандл. партнёры: ЗША, Вялікабрытанія, Нідэрланды, ФРГ, Францыя. Грашовая адзінка — песета.

Усходняя Андалузія. Насаджэнні маслін.



Узброеныя сілы І. складаюцца з сухапутных войск (арміі), ВПС і ВМС. Агульная колькасць (1970) каля 290 тыс. чал. Есць таксама грамадз. гвардыя (каля 60 тыс. чал.) і паліцэйскія сілы (каля 12 тыс. чал.). Вярх. галоўнакамандуючы — кіраўнік дзяржавы; вышэйшае ваен. кіраўніцтва ажыццяўляе савет па пытаннях абароны. Есць 3 мін-вы: сухапутных войск, ВПС і ВМС. Сухапутныя войскі (больш за 210 тыс. чал.) складаюцца з дывізій, асобных брыгад, часцей узмацнення і абслугоўвання. Каля 26 тыс. салдат (3 дывізіі) знаходзяцца ў «іспанскай» Афрыцы, 8 тыс. чал. на Канарскіх а-вах, 6 тыс. чал. на Балеарскіх а-вах. ВПС (каля 35 тыс. чал.) маюць 900 самалётаў (у т. л. 190 баявых) амер. вытворчасці. У складзе ВМС (больш за 45 тыс. чал.) верталётаносец, крэйсер, 4 дызельныя падводныя лодкі, 8 эскадраных мінаносцаў і інш., а таксама каля 9 тыс. чал. марской пяхоты.

Ахова здароўя. Адзінай сістэмы аховы здароўя няма. Пераважае прыватнакапіталістычная з элементамі дзярж. і страхавой медыцыны. У 1968 было 648 бальнічных устаноў на 99,1 тыс. ложкаў (каля 3,1 на 1 тыс. ж.). У 1968 працавала 42,6 тыс. урачоў (1 на 760 ж.), 3,2 тыс. стаматолагаў, 14,6 тыс. фармацэўтаў, 25,1 тыс. чал. сярэд-

няга мед. персаналу. Рыхтуюць урачоў на 11 мед. ф-тах ун-таў. У 1969 нараджальнасць 20,2, агульная смяротнасць 9,0, натуральны прырост 11,2 на 1 тыс. ж., дзіцячая смяротнасць 21,8 на 1 тыс. жыванароджаных. Пашыраны туберкулёз, шкарлятына, бруцэлёз, брушны тыф і паратыфы, бацылярная дызентэрыя, дыфтэрыя, трахома.

Асвета, навуковыя ўстановы. Навучанне носіць фашысцка-клерыкальны характар. З 1953 дзейнічае дагавор паміж Іспаніяй і Ватыканам, паводле якога навучанне ва ўсіх навуч. установах І. грунтуецца на аснове каталіцкіх догмаў. Пач. адукацыю дае 1-ы цыкл 8-гадовай элементарнай школы (4 гады). У 1965/66 навуч. г. ў пач. школах вучылася 3942,2 тыс. вучняў. Сярэдняя школа 7-гадовая (4-гадовая прамежкавая сярэдняя школа і 3-гадовая агульнаадук. або сярэдняя прафес. школа). Дзярж. сярэднія школы наз. інстытутамі, прыватныя — калегіямі. Найб. ун-ты: Мадрыдскі, у Саламанцы, Севільі, Сарагосе, у Вальядалідзе і інш. Б-кі: Нац., Эскарыяла. Музеі: Нац. (Прада), Нац. музей сучаснага мастацтва, Муніцыпальны Мадрыдскі, Нац. археалаг. (усе ў Мадрыдзе), музеі прыгожых мастацтваў у Валенсіі, Севільі, Саморы, Сарагосе і інш. У І. Каралеўскія акадэміі — іспанская, гісторыі, прыгожых мастацтваў, дакладных, фіз. і прыродазнаўчых навук, Нац. медыцыны, іспана-амерыканская; Мадрыдская акадэмія хірургіі, Акадэмія баскскай мовы і іншыя. НДІ: Ін-т біял. даследавання; Ін-т даследавання лесу; Нямецка-іспанскі НДІ гісторыі; Савет па навук. даследаванні, які каардынуе н.-д. работу ў розных галінах навук, і інш.

Друк, радыё, тэлебачанне. У І. выдаюцца больш за 200 газет, бюлетэні і часопісы. Найб. важныя: «Arriba» («Уставай!»), орган франкісцкай партыі «Нац. рух»; «Boletin Oficial del Estado» («Афіцыйны бюлетэнь краіны»), урадавае выданне; «La Vanguardia Española» («Іспанскі авангард»), газета буйной каталонскай буржуазіі і чыноўнікаў; «Diario de Barcelona» («Барселонская газета»), манархісцкая; «Ya» («Ужо»), орган каталіцкіх колаў; «Pueblo» («Народ»), орган Іспанскай прафс. арг-цыі. Нелегальна выдаюцца: органы КПІ — газ. «Mundo Obrero» («Рабочы свет»), часопіс «Nuestra bandera» («Наш сцяг»); «Orizonte» («Гарызонт»), орган Камуніст. саюза ісп. моладзі. Editorial Falange Española (EFE) — інфармацыйнае агенцтва, Radio Nacional de España (RNE), Televisión Española (TVE) — дзярж. службы радыё і тэлебачання.

Літаратура. Развіваецца на іспанскай (кастыльскай) мове, на мовах нац. меншасцей — баскскай, каталанскай і на галісійскім дыялекце партуг. мовы.

Іспанская літаратура фарміравалася ў сярэднія вякі пад уплывам нар. творчасці, араб. і ант. культуры. Спачатку развіваліся нар. лірыка і гераічны эпас («Песня пра майго Сіда»), а з 12 ст. клерыкальна-рыцарская «вучоная літаратура» — паэзія Г. дэ Берсео; авантурна-дыдакт. раманы («Рыцар Сіфар», каля 1300,— першы ісп. рыцарскі раман); гістар. хронікі («Першая ўсеагульная хроніка Альфонса X», 13 ст.); зб. навел-прытчаў «Граф Луканор» (14 ст.) Хуана Мануэля. У 15 ст. пашырыліся нар. рамансы і сатыр. паэзія. Перадрэнесансавыя матывы характэрныя паэзіі маркіза дэ Сантыльяны, лірыцы Х. Манрыке, прозе Ф. Перэса дэ Гусмана, А. Мартынеса дэ Таледа. Творы ранняга Адраджэння — раман-драма Ф. дэ Рохаса «Селестына», лірыка Г. дэ ла Вэгі, рыцарскі раман; сталага Адраджэння — эпічныя паэмы (А. дэ Эрсілья), лірыка (Ф. дэ Эрэра, Л. дэ Леон), пастаральны раман (Х. дэ Мантэмаёр), «маўрытанская» аповесць, шахрайскі раман (ананімная аповесць «Жыццё Ласарылы з Тормеса», 1554; раманы М. Алемана-і-дэ-Энеры, Ф. дэ Кеведа-і-Вільегаса), рэнесансавая драма (Л. дэ Руэда, Х. дэ ла Куэва, вяршыня яе — п'есы Лопэ Ф. дэ *Вэгі Карпіо*, *Тырса дэ Маліны*, Х. Руіса дэ Аларкон-і-Мендосы). Ідэйна-маст. вынік л-ры Адраджэння ў І.— творчасць М. дэ *Сервантэса*, аўтара рамана «Дон Кіхот» (1605—15, бел. пер. 1935, 2 выд. 1940). Барока (17 ст.) выявілася ў прозе Б. Грасіян-і-Маралеса, у паэзіі Л. дэ Гонгара-і-Арготэ, у драматургіі П. *Кальдэрона дэ ла Барка*. У л-ры Асветніцтва (18 ст.) адчуваецца класіцыстычны кірунак (тэарэт. трактат І. дэ Лусана, трагедыі Н. Фернандэса дэ Маратына, Г. дэ ла Уэрты, байкі Т. дэ Ірыяртэ і Ф. М. дэ Саманьега). Бурж.-дэмакр. асветніцкія драмы стваралі Г. М. дэ Хавельянас і Л. Ф. дэ Маратын. Рэаліст. рысы ўласцівы раманам Д. дэ Торэса-і-Вільяраэля, Х. Ф. дэ Іслы, памфлету «Мараканскія пісьмы» Х. Кадальса-і-Васкеса. Перадрамант. матывы адчуваліся ў сентыменталісцкай паэзіі Х. Мелендэса Вальдэса, а на пач. 19 ст. ў паэзіі (М. Х. Кінтана) і драме (Ф. Мартынес дэ ла Роса) рэвалюц.-патрыят. класіцызму. У рамант. л-ры 30-х г. 19 ст. панавалі прагрэс. тэндэнцыі (ранняя творчасць А. дэ Сааведры, герцага Рываса, лірыка і паэмы Х. дэ Эспранседы, драмы А. Гарсія Гуцьерэса, Х. Э. Артсенбуча, А. Хіля-і-Саратэ, гістар. раманы М. Х. дэ Лары, Э. Хіля-і-Караска), пазней узмацніліся кансерватыўныя тэндэнцыі (творчасць Х. Сарыльі-і-Моралі). Пераход да рэалізму намеціўся ў кастумбрысцкай (бытаапісальнай) л-ры (нарысы Р. дэ Месанера Раманаса, драмы М. Брэтона дэ лос Эрэраса), сатыр. публіцыстыцы Лары, сац. рамане Х. Гомеса дэ Авельянеды. У рэаліст. л-ры 2-й пал. 19 ст. выявіліся моцныя рэгіяналісцкія тэндэнцыі — раманы Ф. Кабальера (сапр. прозв. С. Бёль дэ Фабер), Х. М. дэ Перэды, апавяданні А. дэ Труэвы. Пачатак псіхал. раману паклаў Х. Валера. Найб. значны прадстаўнік крытычнага рэалізму — Б. *Перэс Гальдос*, аўтар серыі гістар. раманаў «Нацыянальныя эпізоды» (1873—1912). Ідэі натуралізму, якія прапагандавала Э. Парда Басан, адлюстраваны ў раманах Кларына (сапр. прозв. Л. Алас-і-Урэнья) і А. Паласіо Вальдэса, у паэзіі С. Руэды. З канца 19 ст. побач з традыцыямі крытычнага рэалізму (раманы В. *Бласка Ібаньеса*) развівалася творчасць пісьменнікаў «Пакалення 1898 года», якія адлюстравалі глыбокі крызіс ісп. грамадства і культуры — проза М. дэ Унамуна, Р. М. дэль *Вальe Інклана*, П. Бароха-і-Несі, Асарына (сапр. прозв. Х. Мартынес Руіс), драмы Х. Бенавентэ-і-Мартынеса, паэзія А. Мачада-і-Руіса, Х. Р. Хіменеса. Пасля 1-й сусв. вайны пашырыліся мадэрнісцкія ўпадніцкія плыні — «ультраізм», сюррэалізм і інш.; у процілегласць ім развіваліся творчасць паэта і драматурга Ф. *Гарсія Лоркі*, рэвалюц. паэзія Р. *Альберці*, М. Эрнандэса, сац. проза Р. Х. Сендэра, С. М. *Арканады*, Х. Ардэрыуса, драматургія А. Касоны. У час нац.-рэвалюц. вайны 1936—39 прагрэс. пісьменнікі згуртаваліся вакол Нар. фронту. Пасля ўстанаўлення рэакц. фаш. рэжыму дыктатара Франка многія з іх эмігравалі; крытыка-рэаліст. л-ра заняпала. Першая апазіцыя франкізму ў І.— экзістэнцыялісцкія раманы 40-х г. К. Х. Селы і К. Лафарэт. З 50-х г. у паэзіі ўзмацніўся сац. кірунак (Г. Селая, Б. дэ Атэра, А. Фігера і інш.), а ў прозе — рэаліст. сац. раман (Х. Гайтысола, А. М. Матутэ, Р. Санчэс Ферлосіо, А. Лопес Салінас, Х. Гарсіа Артэлана і інш.).

Баскская літаратура. Зберагліся фрагменты стараж. нар.-эпічных паэм і песень. Нар. паэзія зрабіла ўплыў на зб. рэліг. і любоўных вершаў «Пачаткі баскскай мовы» (1545) Б. Дэчэпарэ. У 17 ст. празаік П. дэ Ашулар, паэты Х. Этчэберы і Б. Гастэлусар пісалі пераважна на рэліг. тэмы; А. Аенарт надрукаваў зб. баск. прымавак і свецкія вершы. Ідэі Асветніцтва адлюстраваны ў паэзіі М. дэ Ларамендзі, Х. І. Істуэты, А. П. Істурыягі, С. Мона, у рамане Х. А. Магель-і-Уркісу «Перу Абарка» (выд. 1881). У рэчышчы рамантызму пісалі паэты Х. М. Іпарагірэ (верш «Дуб Гернікі» стаў гімнам баскаў), І. Біскаронда, байкапісцы Э. М. дэ Аскуэ і Х. Б. Элісамбуру, празаікі А. Чао, Х. В. Аракістайн. Баск. рэаліст. л-ра расквітнела ў канцы 19 — пач. 20 ст. (раманіст Д. дэ Агірэ, драматургі М. Сароа, Х. А. Барыёла, паэты С. дэ Аран Гойры, Э. дэ Уркіяга, Х. М. Агірэ і інш.). Фашызм перашкаджае развіццю баск. л-ры. Можна вылучыць толькі патрыят. паэму «Баск» (1950) Н. дэ Армаэчэа, рэаліст. раманы Х. А. Ірасусты, Х. Эчайдэ.

Галісійская літаратура. У 8—11 ст. развівалася нар. паэзія, часткова ўключаная ў зб. 15 ст. «Кансьянейруш» («Cancioneiros» — «Спеўнікі»), дзе паявіліся і вершы паэтаў 13 ст. Б. дэ Банавала, Ж. Айраша, П. Гоміша Шарыну, легендарнага трубадура 14 і 15 ст. Масіяса. З канца 15 да пач. 19 ст. галісійская л-ра існавала пераважна ў вуснай традыцыі. Надрукаваны толькі творы асветнікаў 18 ст. М. Сарм'ента, М. Фрэйрэ Кастрыльёна, М. Парда дэ Андрадэ. Адраджэнню пісьмовай л-ры спрыялі паэты-рамантыкі

Ф. Аньён-і-Пас, Х. М. Пінтас, браты Антоніо і Франсіска дэ ла Іглесія. У л-ры 19 ст. вылучыліся паэтэса Р. Кастра, паэты М. Курас Энрыкес, Э. Пандаль. Рэаліст. і сатыр. вершы стваралі В. Ламас Карвахаль, Б. Ласада; гістар. раманы М. Амор Мейлан, А. Лопес Ферэйра; нораваапісальныя апавяданні Э. Карэ Альдао, А. Васкес Табаада, бытавыя і сац. раманы М. Вальядарэс, А. Рыбальта. Сярод драматургаў вядомыя Г. Салінас, Э. Альварэс Хіменес, М. Лугрыс Фрэйрэ. Нораваапісальная проза панавала і ў 20 ст. (Х. Леста Мейса, В. Мартынес Рыска і інш.). Сац. накіраванасць уласціва апавяданням А. Радрыгеса Кастэлао, паэзіі В. Тайба Гарсія, Л. Амада Карбальё. Дэкадэнцкі характар мела паэзія Ф. Дэльгада, Х. Відаля, А. Іглесія Альварыньё. Пасля перамогі фашызму галісійская л-ра забаронена; толькі з 1950 узнавілася выданне кніг на галісійскім дыялекце: інтымная лірыка М. Куньі Новаса, Т. Бараса, Э. Нова; грамадз. і патрыят. вершы С. Эміліо Ферэйра, У. Наванейры, М. Марыя; раманы К. Касарэса і інш.

Каталанская літаратура. У 9—13 ст. развівалася вусная нар. паэзія, а з канца 12 ст.— пісьмовая рэліг. л-ра. Імкненне да самабытнасці адчувалася ў хроніках Джаўме І, Б. Дэсклота і Р. Мунтанера, у «Кнізе пра Бланкерне» (каля 1284) Р. Лулія — першым рамане на каталанскай мове, у дыдакт. творах А. дэ Вілановы, Ф. Эшыменіса, у паэзіі 14 ст. (браты Джаўме і Перэ Марк, Б. дэ Со). Ужо ў алегарычным «Сне» (1398) Б. Меджэ і сатыр. «Кнізе пра маракоў» адчуваўся ўплыў ідэй Адраджэння, якія ўмацаваліся ў паэзіі А. Фебрэра, Дж. Фагасота, Дж. дэ Сант-Джордзі, А. Марка, у рэаліст. і сатыр. вершах Дж. Ройса, Дж. Газуля, А. Турмеды, у рыцарскім рамане «Тырант Белы» (1490) Дж. Мартурэля і Дж. дэ Гальбы, у сатыр. вершаванай «Кнізе пра жанчын» (выд. 1531) Дж. Ройга. З канца 15 ст. каталанская л-ра заняпала. На мяжы 18—19 ст. дзейнасць асветнікаў А. дэ Капманя, Масдэў і рэвалюц. падзеі ў І. спрыялі яе адраджэнню. Паэты-рамантыкі пісалі гістар. (Б. К. Арыбаў, Дж. Рубіо-і-Орс, А. Бланк, А. дэ Бафаруль), лірычныя і патрыят. творы (В. Балагер, Дж. Вердагер), услаўлялі людзей працы (Дж. Соль-і-Падрыс). Паявіліся бытаапісальныя апавяданні (Э. Віланова, А. Карэта), сац.-крытычныя рэаліст. раманы (Н. Альер, Дж. Пін-і-Салер), рэаліст. драмы (І. Іглезіяс, С. Русіньёль, А. Гімера). Натураліст. рысы характэрны раманам П. Карамінеса, Р. Казельяса і пісьменніцы К. Альберт (псеўд. В. Катала). Еўрап. дэкаданс зрабіў уплыў на паэтаў-«мадэрністаў» Дж. Марагаля, Г. Аламара, Дж. Карнера. Верныя рэалізму асталіся паэты Э. Гуаньябенс, Дж. М. дэ Сагара, К. Рыба. З 20-х г. 20 ст. вылучылася група паэтаў-«авангардыстаў» (А. Эсклазанс, Дж. Фойш і інш.). Дэмакр. і рэаліст. традыцыі прадаўжалі паэты Т. Гарсес, К. Сальвадор, сатырык Дж. Алівер, празаікі Дж. Руйра, Дж. Э. М. Феранда, П. Бертрана, Дж. Пла і інш. Пасля перамогі фашызму ў І. каталанская л-ра забаронена. З канца 50-х г. узнавілася друкаванне кніг на каталанскай мове. У сучаснай л-ры вядуць барацьбу «неамадэрністы» (экзістэнцыялісты М. дэ Педрола, Б. Банет і інш.) і рэалісты (паэт і празаік С. Эспрыу, паэты Дж. Сарсанедэс, М. Арымань, Г. Фератэр, Ф. Вальверду, нар. пясняр Раймон, раманісты Дж. М. Эспінас, Б. Парсель, Э. Торэс і інш.).

Архітэктура. На тэр. І. зберагліся мегалітычныя пахаванні, фрагменты цыклапічных сцен г. Тарагона, рэшткі рымскіх, гоцкіх пабудоў. У 8—9 ст. узнікаюць цэрквы т. зв. астурыйскага стылю (Сан-Мігель дэ Ліньё і інш. ў Аўеда). З помнікаў буд-ва маўраў, культура якіх мела вял. ўплыў на жыццё І., зберагліся мячэць у Кордаве (8—10 ст.), палац *Альгамбра* ў Гранадзе. З 2-й пал. 11 ст. фарміруецца раманскі стыль (сабор у Сант'яга-дэ-Кампастэла). Помнікі готыкі (13—15 ст.) — саборы Леона, Бургаса, Таледа (кастыльская школа), Барселоны (каталонская школа). Раманскай і гатычнай архітэктуры І. ўласцівая стылёвая разнастайнасць. У 14—16 ст. ствараюцца будынкі, маўрытанскія па форме, канструкцыях і дэкоры, з рысамі гатычнага стылю (потым і Рэнесансу), узнікае т. зв. стыль «мудэхар» (ц. Санта-Марыя ла Бланка ў Таледа, званіца «Ла Хіральда» ў Севільі, 1184—96, закончана ў 1568). У канцы 15 ст. з развіццём Рэнесансу складваецца першы агульнанац. стыль «платэрэска», якому ўласцівы дывановыя пакрыцці сцен, багатае скульптурнае аздабленне парталаў будынкаў, алтароў і іканастасаў (палац герцагаў Інфантада ў Гвадалахары, каля 1480—93, будаўнікі Х. Гуас, Эгуаоміт і інш.). На пач. 16 ст. гал. тэмаю дэкору становіцца ордэр (ун-т у Саламанцы). Поўнае асваенне ордэрнай сістэмы і афіц. палітыка Філіпа II у галіне архітэктуры прывялі да стварэння строгага і простага стылю «эрэрэска» (ад імя прыдворнага арх. Х. Б. дэ Эрэра). Узор яго — палацава-манастырскі ансамбль Эскарыял з геам. прастатой формаў, адсутнасцю дэкору. Як пратэст супраць аскетычнага характару стылю пышна развіваецца ў 17—18 ст. (перш за ўсё ў культавым дойлідстве) ісп. барока з гранічнай насычанасцю дэкору. Кульмінацыйны этап барока — «чурыгерэска» (звязаны з сям'ёй арх. дэ Чурыгера) — прывёў да разбурэння арх. формаў (зах. фасад сабора ў Сант'яга-дэ-Кампастэла, 1738—47, арх. Ф. Касас-і-Навоа; інтэр'ер сакрыстыі манастыра Ла Картуха ў Гранадзе, 1727—64, арх. Л. Арэвала). У 2-й пал. 18 ст. пад уплывам франц. і італьян. дойлідства пашыраецца класіцызм (найб. значны прадстаўнік Х. дэ Вільянуэва). Адсталасць эканомікі І. замарудзіла развіццё ісп. архітэктуры ў 19 ст. Панавалі эклектыка, потым стыль «мадэрн». У 1928 у Барселоне створана «Група ісп. архітэктараў і тэхнікаў для садзеяння прагрэсу сучаснай архітэктуры»; у час Ісп. рэспублікі яна распрацоўвала на аснове прынцыпу функцыяналізму тыпавыя праекты школ. будынкаў універсітэцкага гарадка. Выдатны канструктар гэтага часу Э. Тароха (іпадром Сарсуэла ў Мадрыдзе, 1936, і інш.). Архітэктуры перыяду фашызму ўласцівы адраджэнне сярэдневяковых традыцый, змрочнае стылізатарства, стварэнне псеўдаманумент. культавых будынкаў. Жылы фонд не павялічыўся. Шмат ісп. архітэктараў эмігравалі з І. З 50-х г. пашыраецца функцыяналізм, выкарыстоўваюцца новыя матэрыялы і канструкцыі (аўтамаб. з-д «SEAT» у Барселоне, 1954—56, і інш.), але перадавыя тэндэнцыі развіваюцца ў жорсткай барацьбе з афіц. кансерватызмам. Іл. гл. таксама на ўкл. II.

«Ла Хіральда» — мінарэт (званіца сабора) у Севільі. Стыль «мудэхар». 1184—96 і 1568 (злева). Ф. Касас-і-Навоа. Заходні фасад сабора ў Сант'яга-дэ-Кампастэла. Стыль «чурыгерэска». 1738—47.



Выяўленчае мастацтва. Ад старажытнасці ў І. асталіся паліхромныя наскальныя роспісы (пячора Альтаміра ў Астурыі), мазаікі і фрэскі часоў Ст. Рыма, вестгоцкія каменныя рэльефы і ювелірныя вырабы. Раманскае мастацтва (11—13 ст.) багата адлюстравана скульптурай, у т. л. характэрнай І. драўлянай пафарбаванай, а таксама манумент. жывапісам (роспіс ц. Сан-Клементэ дэ Таўль, 12 ст.). Своеасаблівая гатычная пластыка І. (саборы Бургаса, Леона і інш.). У жывапісе 15 ст. ўзнікае цікавасць да рэальнага свету (Х. Уге, П. Беругетэ), высокім майстэрствам вызначаецца разьба пазаалтарных абразоў — рэтабло (Х. дэ Сілаэ). У канцы 15 ст. пачынаецца ісп. Адраджэнне, але палітыка Філіпа II прыводзіць у 2-й пал. 16 ст. да панавання суровага, змрочнага мастацтва



Іспана - маўрытанская керамічная ваза з люстрам з Альгамбры («Ваза Фартуні»). 14 ст. Эрмітаж. Ленінград.

(Л. Маралес). Пазней містычныя настроі ўвасобіліся ў творчасці *Эль Грэка*. У прыдворных парадных партрэтах гэтага часу ўмоўнасць спалучаецца з праўдзівасцю (А. Санчэс Каэльё). 1-я пал. 17 ст.— час найвышэйшага росквіту ісп. рэалізму. Найб. значныя жывапісцы 17 ст.— Д. *Веласкес*, Х. дэ Рыбера, Ф. Сурбаран. Лепшыя дасягненні скульптуры звязаны з імем Х. Марцінеса Мантаньеса. У 2-й пал. 17 ст. мастацтва жывапісу занепадае (сентымент. рэліг. кампазіцыі Б. Э. Мурыльё) і адраджаецца зноў у канцы 18 ст. ў дэмакр., сацыяльна завостранай творчасці Ф. *Гоі*, якога натхнялі перадавыя ідэі эпохі. У 18 ст. афіцыйныя колы прапагандавалі класіцызм, укаранялі прыдворна-акад. мастацтва, чужое нац. традыцыям. У процівагу салоннаму мастацтву развіваўся гістар. жывапіс, адзначаны рысамі рэалізму (А. Хісберт, Ф. Прадылья). У канцы 19 — пач. 20 ст. ў І. пераплятаюцца разнастайныя тэндэнцыі і іншаземныя ўплывы, пашыраюцца экспрэсіянізм, сюррэалізм (С. Далі). Нац.-рэвалюц. вайна 1936—39 аб'яднала многіх мастакоў у барацьбе супраць фашызму, вызначальнае месца заняла графіка (плакат, лубок, карыкатура). Пасля ўстанаўлення фашызму ў І. пачаўся тэрор, рэаліст. дэмакр. мастацтва праследуецца ўладамі. Афіцыйна прызнаны розныя фармаліст. плыні, заахвочваюцца мастакі-экспрэсіяністы, якія спекулююць на паказе містычных бакоў т. зв. «ісп. духу». Узнікла мастацтва Супраціўлення, яно знаходзіцца ў падполлі. Іл. гл. таксама на ўкл. II да гэтага арт. і да арт. *Афорт*, *Бытавы жанр* (укл. I), *Гістарычны жанр*. (укл. I).

Музыка. Вытокі ісп. нар. музыкі ў песнятанцах ібераў. Яе вызначальныя рысы: цесныя сувязі з танцам, перавага танц. рытмаў з няцотнымі памерамі (пераважна з 3-дольнымі), неаднародная па тыпах ладавай арганізацыі рэльефная мелодыка, вял. роля інстр. суправаджэння. Побач з песнятанцамі (з іх еўрап. пашырэнне набыла сарабанда, стаўшы формай прафесійнай інстр. музыкі) развіваліся сярэдневяковыя кантыгі (духоўныя песні), нар. рамансы і вільянсіка (літар. «вясковая песня», з канца 15 ст.), сялянскія паўстанцкія (17 ст.) і патрыят. песні. Ісп. фальклор багаты на муз. дыялекты. У Басконіі вылучаюцца ваяўнічыя 5-дольныя танцы. У Каталоніі побач з танцамі (сардана і інш.) пашыраны песні розных жанраў. Арагон славіцца песнятанцам хотай. У старадаўнім стылі фальклору Андалузіі кантэ хонда асіміляваны элементы араба-маўрытанскай музыкі. На аснове некат. яго традыцый развіўся экспрэсіўны стыль фламенка. Аформіўся не раней канца 15 ст. пры ўдзеле цыганоў і ўвабраў большасць традыц. песнятанцаў (фанданга, сегедылья), да якіх пазней далучыліся новыя (балеро, хабанэра). Першыя пісьмовыя помнікі прафес. музыкі адносяцца да 5—8 ст.; да 10—11 ст. яна існавала пераважна ў формах культавых спеваў. У эпоху Адраджэння склалася ісп. кампазітарская школа (канец 15 — пач. 17 ст.— т. зв. «залаты век» ісп. музыкі). Х. дэль Энсіна ўвасобіў у сваіх творах рысы нар. муз. жанраў. Л. Мілан і М. дэ Фуэнльяна стварылі ўзоры айч. класікі для віуэлы, лютні, гітары. Развіццё поліфаніі звязана з імёнамі К. дэ Маралеса, Т. Л. дэ Вікторыі (манумент. хар. жанры), А. Кабесона (арганная музыка). Вылучыліся дзеячы муз. навукі (Рамос дэ Парэха, Ф. Салінас і інш.). У 1629 створаны муз.-тэатр. жанр сарсуэлы. У сярэдзіне 17 ст. настаў зацяжны (больш за два стагоддзі) крызіс у ісп. музыцы, які падтрымліваўся антынац. маст. палітыкай правячых колаў. Італьян. ўплыву не пазбегла большасць ісп. кампазітараў 18 — 1-й пал. 19 ст. Сувязь з нар. вытокамі захоўвалася толькі ў адначасткавых клавірных санатах А. Салера, песнях Р. Карнісера, у танадыльях — камедыйных муз.-тэатр. мініяцюрах (значны майстар М. Гарсія). Пераадоленню застою ў ісп. музыцы спрыялі заснаваныя ў Мадрыдзе (1831) і Барселоне (1847) кансерваторыі, Т-р сарсуэлы (1866—67) і Мадрыдскае канцэртнае т-ва (1867). Актыўны муз. дзеяч гэтага часу Ф. Барб'еры. Грамадскі ўздым, звязаны з бурж. рэвалюцыяй 1868—74, абумовіў паяўленне руху Рэнасім'ента («Адраджэнне», ідэолаг Ф. Педрэль). Ён меў на мэце стварыць новую муз. класіку на аснове фальклору і традыцый ісп. школы «залатога веку». Буйныя прадстаўнікі руху канца 19—20 ст. І. *Альбеніс*, Э. Гранадас, М. дэ *Фалья*. З інш. кампазітараў 20 ст.: Х. Нін, Х. Турына, О. Эспла, К. Сурынах. У гады барацьбы з фашызмам кампазітары на чале з Э. Касаль Чапі стварылі шмат патрыят. песень. Гэтая традыцыя прадоўжана ў песнях ісп. Супраціўлення (іх аўтары, вымушаныя працаваць у падполлі, астаюцца невядомыя). Фаш. дыктатура прымусіла многіх значных музыкантаў пакінуць І. З ісп. выканаўцаў 19—20 ст.: скрыпач П. *Сарасатэ*, віяланчэлісты П. *Касальс* і Г. Касадо, спявачкі П. Віярдо-Гарсія, М. Малібран, В. дэ Лос Анхелес, гітарыст А. Сеговія.

Тэатр. Тэатр. паказы вядомы ў І. з часоў уладання рымлян. У сярэднія вякі ў цэрквах і на плошчах ставіліся літургічныя драмы, містэрыі, маралітэ (забаронены ў 1559). Выступалі хуглары з нар. паказамі — «здзеклівымі гульнямі». У 16 ст. папулярныя аўтас сакраменталес (свяшчэнныя дзействы), пасас (фарсы) Лопэ дэ Руэды, камедыі Б. Торэса Наара, інтэрмедыі і драмы М. Сервантэса. Паявіліся паўпрафес. і прафес. трупы (пачынальніка нац. т-ра Лопэ дэ Руэды і інш.). Царк. брацтвы, атрымаўшы манаполію на тэатр. паказы, будавалі памяшканні — каралі (у Мадрыдзе, Барселоне, Валенсіі, Севільі і інш. гарадах). У эпоху Рэнесанса т-р І. дасягае найвышэйшага росквіту (16—17 ст.). Яго дэмакр. і гуманіст. кірунак абумоўлены творчасцю Лопэ дэ Вэгі і яго паслядоўнікаў Тырса дэ Маліны, П. Кальдэрона. У прыдворных т-рах 17 ст. ставіліся феерычныя спектаклі, пышна аформленыя італьян. мастакамі. У 2-й пал. 17 ст. т-р падпаў пад жорсткі ўціск феад.-каталіцкай рэакцыі (у 1665 усе т-ры закрыты на 15 гадоў). З 18 ст. набывае папулярнасць муз. т-р, асабліва італьян. опера; у драме пануе дэкламац. стыль класіцызму. Рэаліст. традыцыі захоўваюцца ў муз.-драм. жанрах сайнеце, сарсуэле, танадыльі. Рэвалюц. рух 19 ст. садзейнічаў уздыму ісп. т-ра. Патрыят. тэма выявілася ў творчасці акцёра І. Майкеса. Пашырыліся рамант. драма і бытавая камедыя. З 2-й пал. 19 ст. пераважалі оперы-буфа, вар'етэ, рэвю франц. ўзору. Рэаліст. традыцый прытрымліваліся асобныя т-ры, акцёры (т-р Камедыі, акцёры Э. Марыо, Р. Кальва). У пач. 20 ст. ў рэпертуары т-раў — камедыі і меладрамы, разлічаныя на густ абывацеля. Пасля абвяшчэння І. рэспублікай перадавыя дзеячы імкнуцца зрабіць т-р даступным нар. масам, адрадзіць дэмакр. тэндэнцыі (дзейнасць Ф. *Гарсія Лоркі*, які заснаваў студэнцкі т-р «Ла Барака»: «Т-ра педагагічных місій» А. Касона, актрысы М. Ксіргу і інш.). У 1936—39 на прафес. т-ры, якія сталі дзяржаўнымі, і асабліва на тэатр. самадзейныя «партызанскія брыгады»

(«Мона асуль» і інш.) зрабіла ўплыў сав. тэатр. мастацтва. Пасля ўстанаўлення франкісцкага рэжыму, у абставінах разгулу рэакцыі многія тэатр. дзеячы эміграваді. Т-р І. перажывае працяглы крызіс, ставяцца нізкапробныя, развесяляльныя п'есы. З уздымам рэвалюц.-дэмакр. руху ў 60-я г. выяўляецца рост прагрэс. дэмакр. тэндэнцый у драматургіі і т-ры (драматург А. Састрэ, рэж. К. дэ ла Торэ і інш.).

Кіно. У 1905 выпушчаны першы маст. фільм. Працавалі кінастудыі ў Барселоне, Мадрыдзе і інш. З 1934 пачалася вытворчасць гукавых фільмаў («Вада ў глебе», рэж. Э. Ф. Ардавін). У гады рэспублікі выпуск фільмаў павялічыўся; з лепшых — дакумент. «Зямля без хлеба» (1932, рэж. Л. Бюнюэль). Пасля ўстанаўлення фаш. дыктатуры асн. кінапрадукцыя — камерцыйныя фільмы. Зрэдку паяўляюцца творы, адзначаныя сац.-крытычнымі тэндэнцыямі: «Сардэчна запрашаем, містэр Маршал!» (1953, Л. Г. Берланга, Х. А. Бардэм), «Смерць веласіпедыста» і «Галоўная вуліца» (1954, 1956, Бардэм), «Вірыдыяна» (1961, Бюнюэль), «Кат» (1963, Берланга). Лепшыя фільмы Бардэма, Берлангі зрабілі ўплыў на кінамастацтва І. пач. 60-х г. (на рэжысёраў К. Сауру, Х. Граў, майстроў т. зв. барселонскай школы — Х. Эстэву, Р. Бофіла, Г. Суарэса і інш.). Прагрэс. рэжысёры працуюць у цяжкіх умовах: цэнзура забараняе непажаданыя ёй сцэнарыі, прадзюсеры адмаўляюцца ставіць іх новыя фільмы, пазбаўляюць урадавых субсідый. З канца 60-х г. большасць рэжысёраў вымушана ставіць муз. кінакамедыі, меладрамы, далёкія ад сац. праблем сучаснага жыцця.

Літ.: Маркс К. и Энгельс Ф. Революция в Испании. Ст. и корреспонденции 1854—1873, М., 1937; Ибаррури Д. Единственный путь, пер. с исп., М., 1962; Мишулин А. В. Античная Испания до установления римской провинциальной системы в 197 г. до н. э., М., 1952; Корсунский А. Р. Готская Испания, М., 1969; Ксенофонтов И. Н. Испания: новый этап борьбы, М., 1969; Социально-экономические проблемы истории Испании, М., 1965; Альтамира-и-Кревеа Р. История Испании, т. 1—2, пер. с исп., М., 1951; Галан Х. М. Крушение монархии в Испании, пер. с исп., М., 1959; Гомес Х. Аграрная проблема во франкистской Испании, пер. с исп., М., 1959; Каррильо С. После Франко — что?, пер. с исп., М., 1966; Хименес Л. Рабочий класс современной Испании, пер. с исп., М., 1970 (гл. таксама літ. да арт. *Іспанская рэвалюцыя 1931—39*); Авдеичев Л. А. и Круковский Ю. А. Страны Пиренейского полуострова, М., 1964; Менендес Пидаль Р. Избр. произв., пер. с исп., М., 1961; Смирнов А. А. Средневековая литература. Испании, Л., 1969; Певзнер А. И. (сост.). Испанская литература (библиограф. указатель), М., 1937; Всеобщая история искусств, т. 1—6, М., 1956—66; Всеобщая история архитектуры, т. 1—8, Л.—М., 1966—70; Малицкая К. М. Испания, М., 1935; яе ж. Испанская живопись XVI—XVII веков, М., 1947; Левина И. Искусство Испании XVI—XVII веков, М., 1966; Искусство стран и народов мира, т. 2, М., 1965; Александрова В. Испанские народные танцы, Л., 1959; Оссовский А. Очерк истории испанской музыкальной культуры, у яго кн.: Избранные статьи, воспоминания, Л., 1961; Морозов П. О. История драматической литературы и театра, т. 1, СПб., 1903; Игнатов С. Испанский театр XVI—XVII веков, М.— Л., 1939; Испания и Португалия, М., 1947, с. 279—327; История западноевропейского театра, т. 1, М., 1956.

В. А. Дзяменцьеў (прырода), *М. Т. Раманоўскі* (гаспадарка), *А. А. Прымачонак* (дзяржаўны лад), *Л. М. Шнеерсон* (гістар. нарыс з 1918), *Дз. П. Бяляцкі* (ахова здароўя), Мінск; *Л. Я. Бялова* (асвета). Масква; *З. І. Плаўскін* (літаратура), *Н. С. Забалоцкая* (архітэктура, выяўл. мастацтва), *В. М. Аляксандрава* (музыка). Ленінград; *А. К. Саннікаў* (тэатр). Мінск.

ІСПА́НСКАЯ МО́ВА, самая пашыраная мова з раманскай групы *індаеўрапейскіх моў*. Дзярж. мова Іспаніі, усіх краін Паўд. і Цэнтр. Амерыкі (апрача Бразіліі і Гаіці) і Мексікі. Ею карыстаецца таксама насельніцтва колішніх ісп. калоній у Афрыцы — Марока, Танжэра, Філіпінскіх а-воў і паўд. р-наў ЗША. На І. м. гаворыць болей за 140 млн. чал.

І. м. стала развівацца з народнай латыні, прынесенай на Пірэнейскі п-аў рымлянамі ў 2-ю Пунічную вайну (218—201 да н. э.). Заваяванне Іспаніі герм. плямёнамі (5 ст.) і арабамі (8—15 ст.) зрабіла ўплыў толькі на слоўнікавы склад І. м. У аснову літ. І. м. лёг дыялект Кастыліі, таму доўгі час яна называлася кастыльскаю. Алфавіт І. м. на аснове лацінскага. Дыялекты распадаюцца на 2 асн. групы — паўночную (леона-астурыйскія і арагонскія дыялекты) і паўднёвую (андалузскі, мурсійскі і дыялект Эстрэмадуры). Спецыфічныя рысы І. м. Лац. Амерыкі выяўляюцца пераважна ў лексіцы і вымаўленні. Асн. асаблівасці І. м.: у фанетыцы — у націскным і ненаціскным становішчы ўсе галосныя вымаўляюцца выразна, шматлікія дыфтонгі і трыфтонгі ўтвараюцца шляхам спалучэння моцных галосных з слабымі, націск звычайна на апошнім або перадапошнім складзе; у марфалогіі — нескланяльнасць назоўнікаў і прыметнікаў, вялікая колькасць марфалаг. і аналіт. формаў дзеяслова, размеркаваных па 4 ладах. Лексіка І. м. пераважна з нар. латыні, значэнне многіх слоў моцна змянілася. У слоўнікавым складзе шмат германізмаў, галіцызмаў, арабізмаў і інш.

Літ.: Шишмарев В. Очерки по истории языков Испании, М.— Л., 1941; Васильева-Шведе О. К. и Степанов Г. В. Грамматика испанского языка, 2 изд., М., 1963; Карпов Н. П. Фонетика испанского языка, М., 1969; Испанистика в СССР. Библиография. 1918—1969, М., 1970; Испанский язык. Библиогр. иностр. лит., в. 1, М., 1970.

Н. Д. Аруцюнава. Масква.

ІСПА́НСКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ 1931—39, бурж.-дэмакр. рэвалюцыя, якая з ліп. 1936 набыла характар нац.-рэвалюц. вайны супраць ісп. і міжнар. фашызму.

У параўнанні з інш. еўрап. краінамі Іспанія доўгі час аставалася манархіяй са шматлікімі феад. перажыткамі, якія стрымлівалі развіццё прамысловасці і с. гасп. Супярэчнасці паміж блокам землеўладальніцкай арыстакратыі і фін. алігархіі — з аднаго боку, і ісп. народам у цэлым — з другога, асабліва паглыбіліся ў пач. 30-х г. У бурж.-дэмакр. рэвалюцыі аб'ектыўна былі зацікаўлены рабочыя, сяляне, дробная гарадская і неманапалістычная буржуазія, прагрэс. інтэлігенцыя. 17.8.1930 на нелегальнай нарадзе ў Сан-Себасцьяне лідэры рэсп. партый Іспаніі стварылі Рэвалюц. к-т для падрыхтоўкі звяржэння манархіі. Пад уплывам магутных паліт. забастовак і вынікаў выбараў у муніцыпалітэты, у час якіх народ рашуча выказаўся супраць манархіі, к-т абвясціў рэспубліку, сфарміраваў часовы ўрад. У выніку мірнай рэвалюцыі да ўлады прыйшоў блок буржуазіі, выключаючы некат. групы манапал. капіталу. Каб не адштурхнуць ад сябе нар. мас, буржуазія ўвяла ў урад Сацыяліст. партыю і адхіліла (снеж. 1931) ад улады найбольш правыя партыі — Кансерватыўную і Радыкальную. Урад правёў некат. рэформы (бурж.-дэмакр. канстытуцыя 1931, аддзяленне царквы ад дзяржавы, перадача сялянам часткі зямлі за выкуп, аўтаномія Каталоніі і інш.). Але рэформы з-за сваёй абмежаванасці і непаслядоўнасці не падрывалі асноў эканам. і паліт. магутнасці памешчыкаў і фін. капіталу. Асталіся ўладанні сеньёраў, натуральная рэнта, здольшчына, паншчына, стары манарх. апарат кіравання. У вер. 1933 рэсп. сацыяліст. блок распаўся. Паліт. крызіс выкарыстала рэакцыя і на выбарах у картэсы (ліст. 1933) дамаглася перамогі. Рэакц. сілы аб'ядналіся ў арг-цыю клерыкальна-фаш. кірунку — Канфедэрацыю аўтаномных правых (СЭДА). У 1934 яна ўвайшла ў урад. У адказ нар. масы пачалі ўсеаг. забастоўку, якая ў Астурыі, Каталоніі, Мадрыдзе і інш. мясцінах краіны перарасла ва ўзброенае паўстанне — Кастрычніцкія баі. Нягледзячы на паражэнне, баі сарвалі спробу фашызму захапіць уладу, паказалі, што поспеху ў барацьбе нельга забяспечыць без адзінства ўсіх дэмакр. сіл. Па ініцыятыве *Камуністычнай партыі Іспаніі* (КПІ) 15.1.1936 створаны Нар. фронт. Ён перамог на выбарах 1936 у картэсы. Але з-за пазіцыі сацыялістаў, якія спадзяваліся захапіць ула-

ду, быў сфарміраваны рэсп. ўрад без камуністаў і сацыялістаў. Ён не зрабіў захадаў, каб абараніць дэмакр. лад, пайшоў на ўступкі рэакцыі. На камандных пасадах у арміі асталіся варожыя рэспубліцы генералы. У кантакце з засн. ў 1933 фаш. партыяйІсп. фаланга і рэакц. арг-цыяй «Абнаўленне Іспаніі» і пры падтрымцы памешчыцка-фін. алігархіі яны 18.7.1936 пачалі фаш. мяцеж (узначаліў ген. Ф. Франка). Мяцежнікаў актыўна падтрымаў германскі і італьянскі фашызм. Пачалася грамадз. вайна. Яна вылілася ў нац.-рэвалюц. вайну супрацьІсп. і міжнар. фашызму. Исп. народу ў яго гераічнай барацьбе памагаў Сав. Саюз. У *Інтэрнацыянальных брыгадах* за Исп. рэспубліку змагаліся добраахвотнікі-антыфашысты з многіх краін свету, у т. л. сав. грамадзяне. За мужнасць і адвагу, праўленыя ў гэтай барацьбе, звання Героя Сав. Саюза ўдастоены беларусы С. І. Грыцавец, Ф. К. Каўроў, П. Е. Купрыянаў, Г. М. Скілзнёў, М. А. Сялецкі. Сярод інтэрнацыяналістаў былі К. П. Арлоўскі, В. З. Корж, А. М. Рабцэвіч і інш.

У першы перыяд нац.-рэвалюц. вайны рэсп. войскі дамагліся шэрагу перамог. Паглыбіўся сацыяліст. характар рэвалюцыі (рабочы кантроль над вытворчасцю, абагульненне многіх буйных банкаў і прадпрыемстваў, надзяленне сялян зямлёю, аўтаномія нац. меншасцей і г. д.). Ініцыятарам рэвалюц. пераўтварэнняў выступала КПІ. З вер. 1936 яна ўдзельнічала ва ўрадах Нар. фронту. Развіццё падзей у Іспаніі напалохала міжнар. рэакцыю. Германія і Італія накіравалі (канец 1936) на дапамогу Франка войскі і ваен. тэхніку. ЗША, Вялікабрытанія і Францыя занялі палітыку «неўмяшання», паводле якой Исп. рэспубліцы было адмоўлена ў пастаўках зброі і інш. дапамозе. У той жа час мяцежнікі атрымалі ад кампаній ЗША 1866 тыс. *т* гаручага, 12 тыс. грузавікоў. Паражэнню исп. народа аб'ектыўна садзейнічалі адсутнасць адзінства ў Нар. фронце, капітуляцкая плынь у кіруючых колах Исп. рэспублікі, асабліва сярод сацыяліст. лідэраў. 5.3.1939 капітуляванты зрабілі дзярж. пераварот. Правыя сацыялісты і анархісты стварылі Нац. хунту абароны, якая здрадзіла інтарэсам народа, згадзілася з патрабаваннем Франка аб капітуляцыі. 28.3.1939 рэспубліка перастала існаваць. У краіне ўсталяваўся фаш. рэжым Франка.

Іспанія была першай у гісторыі арэнай барацьбы сіл дэмакратыі і фашызму. У час рэвалюцыі 1931—39 на яе тэр. ўсталявалася рэспубліка новага тыпу без памешчыкаў, буйной буржуазіі і ваеншчыны. Исп. рэспубліка была правобразам нар.-дэмакр. дзяржавы. Рэвалюцыя адтэрмінавала 2-ю сусв. вайну, з'явілася школай для сусв. камуніст. руху і першаперш для исп. народа і КПІ, якія не спыняюць барацьбы супраць фаш. рэжыму.

Літ.: Ибаррури Д. Единственный путь, пер. с исп., М., 1962; История Коммунистической партии Испании, М., 1961; Война и революция в Испании 1936—1939, т. 1, пер. с исп., М., 1968; Пономарева Л. В. Рабочее движение в Испании в годы революции 1931—1934, М., 1965; Майданик К. Л. Испанский пролетариат в национально-революционной войне. 1936—1937 гг., М., 1960; Родимцев А. И. Под небом Испании, М., 1968; Гарсиа Х. Испания Народного фронта, пер. с исп., М., 1957; Листер Э. Наша война, пер. с исп., М., 1969. *Л. М. Шнеерсон.* Мінск.

ІСТ, вёска ў Яшенскім с/с Міёрскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр саўгаса «Дзісненскі». За 58 *км* на ПдУ ад Міёраў, 152 *км* ад Віцебска, 16 *км* ад чыг. ст. Загацце. 316 ж., гасп. 86 (1971). Швейная майстэрня. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, дзіцячыя яслі-сад, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, сталовая, магазін. Ням.-фаш. захопнікі загубілі 30 мірных жыхароў. Помнік воінам-землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ІСТОМІН Уладзімір Іванавіч [1809—7(19).3.1855], герой Севастопальскай абароны 1854—55, контр-адмірал (1853). Вызначыўся ў Наварынскай бітве 1827 і ў блакадзе Дарданелаў (1828—29), у Крымскую вайну 1853—56 у Сінопскай бітве 1853. Адзін з кіраўнікоў абароны Севастопаля, узначальваў абарону Малахава кургана і сумежных рэдутаў. Загінуў і пахаваны ў Севастопалі.

Літ.: Тарле Е. В. Соч., т. 8—9, М., 1959; П. С. Нахимов. Документы и материалы, М., 1954.

ІСТОМІНА Аўдоцця Ільінічна [6(17).1.1799, Пецярбург — 26.6(8.7).1848], руская балерына. Скончыла Пецярбургскае тэатр. вучылішча (1815). У 1816—36 у трупе пецярбургскага Вял. т-ра. Спалучала віртуозную харэаграф. тэхніку з яркімі акцёрскімі здольнасцямі. Выконвала цэнтр. партыі ў пастаноўках Ш. Дзіло, у т. л. «Ліза і Кален, ці Марная засцярога»; «Зефір і Флора» і «Каўказскі пявольнік, ці Цень нявесты» К. Каваса. А. Пушкін увекавечыў вобраз І. у 1-м раздзеле «Яўгена Анегіна».

Літ.: Эльяш Н. Авдотья Истомина, Л., 1971.

ІСТОПКА (стопка), будыніна, дзе хаваюць на зіму агародніну. Тое, што і *варыўня*.

ІСТЭРЫЯ (грэч. hystéra матка; стараж. грэкі лічылі І. вынікам хвароб маткі), функцыянальная нервова-псіхічная хвароба з групы *неўрозаў*. Бывае ў жанчын і мужчын. Клініка І.: прыпадкі (слёзы, смех, крыкі, сутаргі), парушэнне адчувальнасці (да болю, холаду і інш.) і рухаў (паралічы, спазмы, заікание), істэрычныя паводзіны (празмерны эгаізм, рэзкія перамены настрою). Лячэнне: псіхатэрапія, унушэнне (сугестыя), гіпноз, агульнаўмацавальныя сродкі. Прафілактыка: працоўнае выхаванне, фізкультура, спорт, развіццё грамадскай цікаўнасці.

Літ.: Павлов И. П. Проба физиологического понимания симптомологии истерии, Полн. собр. соч., т. 3, кн. 2, 2 изд., М.—Л., 1951; Марков Д. А. Основы патогенетической терапии заболеваний нервной системы, Мн., 1964; Антонов И. П. и Шанько Г. Г. Судорожные состояния у детей, Мн., 1970. *М. М. Корыт.* Мінск.

ІСФАХАН (Іспагань), горад у цэнтр. ч. Ірана, на р. Заендэруд. Адм. ц. астана Ісфахан. Чыг. ст., вузел аўтамаб. дарог і караванных шляхоў. Аэрапорт. 424 тыс. ж. (1966). Важны прамысл., гандл. і культ. цэнтр краіны. За 50 *км* ад І. з дапамогаю СССР будуецца (1972) металург. камбінат. Тэкст. (у т. л. дывановая), харч., гарбарная, металаапр. прамысловасць. Саматужныя вырабы. Ун-т.

Пад назвай Аспадан горад упамінаецца ў антычных аўтараў. У 644 захоплены арабамі, у 1-й пал. 13 ст. пацярпеў ад мангола-татараў, у 1387 захоплены Цімурам. Найб. росквіту дасягнуў у канцы 16 — пач. 17 ст., калі стаў сталіцай *Сефевідаў дзяржавы*. У 1722 захоплены і разрабаваны афганцамі, пасля чаго на доўгі час заняпаў. Сучасны І. падзелены сеткай прамых магістраляў, паміж якімі збярогся лабірынт вузкіх вулачак сярэдневечча. На паўд. беразе р. Заендэруд — фабрычныя кварталы. Сярод арх. помнікаў: Саборная мячэць

ІТАЛІЯ





(9—20 ст.; іл. гл. на ўкл. да арт. *Іран*); комплекс пл. Мейдане-Шах з палацам Алі-Капу (15 ст., дабудаваны ў 17 ст.) і мячэцямі шэйха Латфалы (17—18) і Шахскай (17 ст.); комплекс медрэсэ Мадарэ-Шах (18 ст.); масты 17 ст.

ІСХАНАЎ Берген (22.10.1922, в. Ярмолаўка Чымкенцкага пав. Сырдар'інскай вобл.— 14.10.1970), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). Чл. КПСС з 1946. У Чырв. Арміі з 1942. Вызначыўся ў Гомельскай вобл. 15.10.1943 у складзе дэсантнай групы фарсіраваў Дняпро, захапіў варожыя траншэі, на замацаваным плацдарме адбіў 3 варожыя контратакі.

ІСЦІНА, правільнае, праверанае на практыцы адлюстраванне рэчаіснасці ў свядомасці чалавека. І.— мэта пазнання, магутны сродак пераўтварэння рэчаіснасці. Дыялектыка-матэрыяліст. філасофія прызнае аб'ектыўную І., якая з'яўляецца такім зместам уяўленняў чалавека, які не залежыць ад суб'екта, не залежыць ні ад чалавека, ні ад чалавецтва. Складаны характар пазнання бясконцай і невычарпальнай прыроды раскрывае дыялектыка-матэрыяліст. вучэнне пра суадносіны І. абсалютнай і адноснай. Абсалютная І.— поўнае, вычарпальнае, правільнае веданне пра аб'екты. Адносная І.— веды хоць і правільныя, але няпоўныя, якія патрабуюць паглыблення і ўдакладнення. І.— бясконцы працэс назапашвання ведаў, калі няпоўныя веды заменьваюцца ўсё больш поўнымі і глыбокімі. Чалавечае мысленне здольнае даць нам і дае абсалютную І., якая складаецца з сумы адносных І. Ва ўсякай адноснай І. ёсць зерні абсалютнай І. Таму з развіццём пазнання чалавека павялічваюцца элементы абсалютных ведаў. Абстрактнай І. няма, яна заўсёды канкрэтная. Гэта азначае, што неабходна ўлічваць канкрэтную сітуацыю: умовы, месца і час, у якіх знаходзяцца аб'екты. Палажэнні, ісцінныя пры адных умовах, могуць стаць няісцінными ў іншых, а таксама пры змяненні самога аб'екта. У. І. Ленін падкрэсліваў, што ўсякую І. можна давесці да абсурду, калі яе распаўсюдзіць за межы сапраўднай дастасавальнасці (гл. Тв., т. 31, с. 43). Марксізм-ленінізм непрымірымы да дагматызму, які ігнаруе неабходнасць уліку канкрэтных умоў, абсалютызуе тэарэт. палажэнні, а таксама да *рэлятывізму*, які абсалютызуе адноснасць чалавечага пазнання, атаясамлівае адноснасць з суб'ектыўнасцю, адмаўляючы аб'ектыўную І. Навук. крытэрый І.— грамадская *практыка*.

Літ.: Энгельс Ф. Анты-Дзюрынг, Мн., 1952; Ленін У. І. Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм, Тв., т. 14, разд. 2 (Полн. собр. соч., т. 18, гл. 2); яго ж. Яшчэ раз аб прафсаюзах, аб бягучым моманце і аб памылках Троцкага і Бухарына, Тв., т. 32 (там жа, т. 42); Некоторые вопросы критерия истины в научном познании, Краснодар, 1969; Воловик Л. А. и Дроздова Э. М. Истина в марксистской и домарксовой философии, М., 1965.

В. І. Сулпанаў. Мінск.

ІСЫК-КУЛЬ, бяссцёкавае возера ў Кірг. ССР. Размешчана ў міжгорнай катлавіне ў Цянь-Шані на выш. 1609 *м* над узр. м. Пл. 6280 *км²*, найб. глыб. 702 *м*, сярэдняя 279 *м*. Вадазбор 21,9 тыс. *км²*. Берагі слаба парэзаныя. Вада саленаватая (каля 6‰). Т-ра вады на паверхні летам да 20, зімою каля 2,7 °С, адкрытая ч. не замярзае. Прамысл. рыбы: голы асман, чэбак, сазан, марынка, стронга. Гал. прыстані Пржавальск, Рыбачае. Іл. гл. ў арт. *Кіргізская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка.*

ІСЫК-КУЛЬСКАЯ ВОБЛАСЦЬ, у складзе Кіргізскай ССР. Размешчана на У рэспублікі. Утворана 13.12.1970. Пл. 42,2 тыс. *км²*. Нас. 311,6 тыс. чал. (1970). Падзял. на 4 раёны; 2 гарады, 6 гар. пас. Цэнтр г. Пржавальск.

Вобласць займае высакагорную частку Цянь-Шаня (ад 1608 да 7439 *м*, пік Перамогі). На Пн — Ісык-Кульская катлавіна (з воз. Ісык-Куль), акаймаваная хрыбтамі Кунгей-Алатау і Тэрскей-Алатау. На Пд ад Тэрскей-Алатау горная вобл. з высокімі хрыбтамі, падзеленымі глыбокімі рачнымі далінамі на У і вялікімі паката-хвалістымі высакагорнымі раўнінамі на З. На У горны масіў Хан-Тэнгры, укрыты ледавіком (пл. абледянення ў межах вобл. 1580 *км²*). Карысныя выкапні: поліметал. руды і кам. вугаль (Джэргалан), волава (бас. р. Сарыджаз), буд. матэрыялы. Есць мінер. крыніцы. Клімат Ісык-Кульскай катлавіны ўмерана цёплы. Сярэдняя т-ра ліп. ад 16,5 да 17,5 °С, студз. ад −4 да −4,5 °С. Ападкаў ад 115 *мм* на З да 717 *мм* на У катлавіны. У гарах клімат халодны. Сярэдняя т-ра ліп. ад 3,9 да 10,1 °С, студз. ад −15 да −21,2 °С. Ападкаў 190—310 *мм*. Найб. рэкі: Сарыджаз, Нарын, Цюп. Глебы Ісык-Кульскай катлавіны светла- і цёмна-каштанавыя, на высакагорных сыртах — горна-лугавыя і лугава-балотныя. Расліннасць паўпустынная і сухастэпавая, у высакагорнай зоне — горныя лугі. На схілах хр. Тэрскей-Алатау і ў пекат. рачных далінах бас. р. Сарыджаз — лясы з цянь-шаньскай елкі. Асн. насельніцтва І.-К. в.— кіргізы. Жывуць таксама рускія, украінцы, узбекі, дунгане, казахі, татары і інш. Насельніцтва размешчана пераважна на прыазёрных раўнінах і на конусах выносу горных рэк, на выш. ад 1600 да 2000 *м* над узр. м., дзе шчыльн. 25—40 чал. на 1 *км²*. Сярэдняя шчыльн. нас. 7,2 чал. на 1 *км²*. Гарадскога — 28,4%.

І.-К. в.— важны с.-г. раён. У 1971 было 41 калгас і 15 саўгасаў. Пад ворнымі землямі 174,5 тыс. *га*, пад пашай 1,4 млн. *га*. Развіта танкарунная авечкагадоўля, малочна-мясная жывёлагадоўля; разводзяць племянных коней. У 1971 было (тыс. галоў): авечак і коз 1683, буйн. раг. жывёлы 104, коней 40,7, свіней 15,2. І.-К. в.— галоўны вытворца лекавага маку ў



СССР; значныя пасевы збожжавых (пшаніца, ячмень, авёс), бульбы, развіта садоўніцтва і вінаградарства. Прамысл. харчовая (пераважна мяса-малочная) і машынабудаванне. У вобл. 45 прамысл. прадпрыемстваў; большасць іх у Пржавальску і Рыбачым. Электрамеханічны (Пржавальск) і электратэхн. з-ды (г. п. Каджы-Сай), суднаверф, мясакамбінат (Рыбачае), цементавы з-д (г. п. Ак-Булак), плодавінкамбінат, швейна-абутковая ф-ка (Пржавальск). У г. п. Джэргалан і Каджы-Сай здабыча вугалю на мясцовыя патрэбы. На Ісык-Кулі лоўля рыбы. У Прысыккуллі многа курортаў, санаторыяў, дамоў адпачынку і турысцкіх баз. Да Рыбачага падыходзіць чыгунка ад Фрунзе. Найважн. аўтамаб. дарогі вакол возера, злучаюць Пржавальск праз Рыбачае з раёнамі Чуйскай далiны і Нарынскай вобл. Суднаходства па Ісык-Кулі. У вобл. пед. ін-т, 3 сярэднія спец. навуч. ўстановы. Абл. газ. «Ысык-Көл правдасы» («Ісык-кульская праўда») на кірг. і рус. мовах.

Ш. Такамбаеў, К. Рахманаў. Фрунзе.

ІТАЛА-ЭФІОПСКІЯ ВОЙНЫ, калан. войны Італіі супраць Эфіопіі.

Вайна 1895—96. У 1885 італьян. войскі захапілі эфіопскі порт Масаўа і ўмацаваліся ў некат. паўн. раёнах краіны. Пасля некалькіх узбр. сутычак 1887—88 і паражэння італьянцаў пры Догалі быў заключаны італа-эфіопскі дагавор 1889 пра дружбу і гандаль. Італія скажона вытлумачыла 17-ы пункт дагавору і ў 1889 абвясціла пра свой пратэктарат над Эфіопіяй. Эфіопскі ўрад не прызнаў гэтай прэтэнзіі і тэрытарыяльных захопаў Італіі. У адказ італьян. войскі акупавалі (1895) частку Эфіопіі, але 1.3.1896 у бітве пры Адуа былі пераможаны. Паводле дагавору 1896 Італія мусіла прызнаць Эфіопію незалежнай.

Вайна 1935—36. Распачата Італіяй пры заахвочванні ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі і Германіі. Была адным са звеняў, якія спрыялі распальванню 2-й сусв. вайны. 3.10.1935 італьян. армія пачала ваен. дзеянні супраць Эфіопіі. У баях выкарыстоўвала атрутныя рэчывы. 5.5.1936 італьян. войскі ўвайшлі ў сталіцу Эфіопіі Адыс-Абебу. 1.6.1936 італьян. ўрад абвясціў, што Эфіопія разам з Эрытрэяй і Італьян. Самалі ўваходзіць у адзінае калан. ўладанне — Італьян. Усх. Афрыку. Эфіопскі народ не спыніў барацьбы за вызваленне. Разгарнуўся магутны партыз. рух. У войнах і ў час італьян. акупацыі ў Эфіопіі загінула 760 тыс. чал. Канчаткова акупанты выгнаны (1941) з эфіопскай зямлі ў перыяд вызвалення Усх. Афрыкі ад італьян.-італьян. войск.

ІТАЛІЙСКІЯ МОВЫ, група *індаеўрапейскіх моў*, пашыраных у 1-м тысячагоддзі да н. э. ў Італіі. Складалася з 3 падгруп: оскска-умбрскай (уваходзілі таксама сабельскія дыялекты), лацінска-фаліскскай і венецкай. Некаторымі асаблівасцямі І. м. збліжаюцца з кельцкімі. Карысталіся пісьмом, запазычаным у этрускаў. На *лацінскай мове* створана багатая л-ра, ад астатніх зберагліся толькі надпісы. І. м. ў 1 ст. н. э. растварыліся ў лацінскай.

Літ.: Тронский И. М. Очерки из истории латинского языка, М.—Л., 1953.

ІТАЛІКІ (лац. Italici), плямёны і народнасці, якія насялялі ў старажытнасці Апенінскі паўвостраў.

Розніліся моваю, памерамі тэрыторый, колькасцю насельніцтва, узроўнем культуры і эканомікі. Найб. шматлікія былі плямёны этрускаў, лацінаў, самнітаў. Рым, засн. паводле падання лацінскімі каланістамі ў 8 ст. да н. э., пазней узвысіўся над І. У выніку рым. экспансіі ў 5—3 ст. да н. э. І. страцілі самастойнасць, калі ⅓ іх зямель перайшло да Рыма. У выніку Саюзніцкай вайны 90—88 да н. э. атрымалі правы рым. грамадзянства.

Літ.: Немировский А. И. История раннего Рима и Италии, Воронеж, 1962; Нечай Ф. М. Рим и италики, Мн., 1963; Модестов В. И. Введение в римскую историю. Вопросы доисторической этнологии и культурных влияний в дорийскую эпоху в Италии и начало Рима, ч. 1—2, СПб., 1902—04.

Ф. М. Нячай. Мінск.

ІТАЛІЯ (Italia), Італьянская Рэспубліка, дзяржава на Пд Еўропы. Займае мацерыковую частку, Апенінскі п-аў, а-вы Сіцылію, Сардзінію і шэраг дробных а-воў. Пл. 301,2 тыс. *км*², насельніцтва 54,5 млн. чал. (1970). Сталіца Рым. Краіна падзяляецца на 94 правінцыі. [На ўклейках: фіз. карта, эканам. карта, Прырода (I), Гасп. (I, II), Гістар. нарыс (II), Архітэктура (III), Выяўл. маст. (IV)].



Дзяржаўны лад. І. парламентарная рэспубліка. Дзейнічае канстытуцыя 1947. На чале дзяржавы прэзідэнт, які выбіраецца на 7 гадоў. Вышэйшы заканадаўчы орган — парламент, складаецца з 2 палат: сената і палаты дэпутатаў. Члены палаты дэпутатаў выбіраюцца на 5 гадоў; частка сенатараў назначаецца пажыццёва прэзідэнтам або ўваходзіць у склад сената паводле права (былыя прэзідэнты), частка выбіраецца. Выканаўчую ўладу ажыццяўляе ўрад — Савет Міністраў. Суд. сістэма: Вышэйшы касацыйны суд, апеляцыйныя суды, трыбуналы, суды асізаў, міравыя суды (прэторы), спец. суды.

Прырода. Горы і ўзвышшы займаюць амаль ⅘ тэрыторыі. Па асаблівасцях прыроды ў І. вылучаецца тры вобласці: Італьянскія Альпы, *Паданская нізіна* і *Апенінскі паўвостраў* з астравамі. Альпы займаюць крайнюю поўнач І., падымаюцца вышэй за 4000 *м* (г. Манблан 4807 *м*, на граніцы з Францыяй і Швейцарыяй), востраканцовыя вяршыні ўкрыты снегам і ледавікамі, паўд. схілы стромкія. Паміж Альпамі і Апенінамі — Паданская нізіна, складзеная з алювіяльных наносаў, месцамі забалочаная. Па Апенінскім п-ве праходзяць сярэдневышынныя горы Апенiны (г. Корна выш. 2914 *м*). Усх. схілы стромкія, зах. пакатыя. Паміж Апенінамі і Тырэнскім м. узгорыстая раўніна. Гарысты рэльеф пераважае і на астравах. Ёсць дзейныя вулканы (Везувій, Стромболі, Этна), бываюць землетрасенні. Карысныя выкапні: самародная сера, ртутная руда, пірыт, мармур, буд. матэрыялы і некат. руды каляровых металаў (алюмінію, цынку, свінцу). Невял. радовішчы кам. і бурага вугалю, нафты і прыроднага газу. Клімат на большай частцы І. міжземнаморскі, на Паданскай нізіне пераходны да ўмеранага, у верхнім поясе гор халодны. На Апенінскім п-ве сярэдняя т-ра студз. ад 1,5—4 на Пн да 10—11,5 °С на Пд, чэрв. адпаведна ад 24 да 25 °С. Ападкаў 500—1500 *мм* за год, на зах. ўзбярэжжы і ў горах месцамі больш за 3000 *мм*. На Паданскай нізіне сярэдняя т-ра студз. каля 0 °С, чэрв. ад 23 да 25 °С, ападкаў 600—1000 *мм* за год. У межах Італьян. Альпаў сярэдняя т-ра студз. ад 1 у перадгорнай зоне да −12 °С у субальпійскай, чэрв. адпаведна 20 і 4 °С. Ападкаў усюды больш за 1000 *мм*. Рачная сетка густая толькі ў Альпах і на Паданскай нізіне. Найб. р. По (650 *км*). Транспартнае значэнне рэк нязначнае, выкарыстоўваюцца на арашэнне. Рэкі паўн. І. багатыя на гідраэнергію. У Альпах многа азёраў, пераважна ледавіковага паходжання — Гарда, Лага-Маджорэ, Кома і інш. У паўн. раёнах і на Паданскай нізіне пераважаюць бурыя лясныя і алювіяльныя глебы, у ніжняй і сярэдняй зоне Апенінаў — горналясныя бурыя і перагнойна-карбанатныя, на Апенінскім п-ве — каштанавыя і субтрапічныя бурыя лясныя глебы. Пашырана эрозія. На Пн І. пераважае сярэднееўрап. тып расліннасці, на паўвостраве і астравах — міжземнаморскі (мірты, лаўры, дзікія маслiны, фісташкі). Жывёльны свет характарызуецца мноствам паўзуноў і птушак. Трапляюцца серна, тхор, куніца, вавёрка, з марскіх рыб прамысловыя тунец, макроль, сардзіна, камбала. У краіне 2 Нац. паркі агульнай пл. 1750 *км*².

Насельніцтва. Па колькасці жыхароў І. займае 3-е месца (пасля ФРГ і Вялікабрытаніі) у Зах. Еўропе. Вялікая эміграцыя (200—300 тыс. чал. штогод). 98% насельніцтва італьянцы, невял. колькасць фрыулаў, цірольцаў, албанцаў, французаў і інш. Дзярж. мова — італьянская, большасць веруючых католікі. У зах. ч. Рыма цэнтр сусв. каталіцызму *Ватыкан*. Сярэдняя шчыльнасць нас. І. 180,9 чал. на 1 *км*². Найб. густа заселены Міланскі і Неапалітанскі прамысл. раёны і с.-г. раўнінныя раёны. Гар. насельніцтва каля 50%. Вял. гарады (тыс. ж., 1968): Рым (2656), Мілан (1687), Неапаль (1267), Турын (1142), Генуя (844), Палерма (652), Балонья (487).



Балонья. Вія Індыпендэнца — адна з цэнтральных вуліц.

Гістарычны нарыс. Пасля падзення ў 476 рабаўладальніцкай Зах. Рымскай імперыі (гл. *Рым* Старажытны) тэр. І. стала раёнам нашэсця і барацьбы герм. плямёнаў. У 476 узнікла варварскае каралеўства Адаакра. У 493 у Паўн. І. заснавалі сваё каралеўства остготы на чале з Тэадарыхам. Яны перамаглі Адаакра. У сярэдзіне 6 ст. Візантыя заваявала Сіцылію, потым Пд І., Рым. У 568 уварвалася герм. племя лангабардаў, пры якім паскорылася развіццё феад. адносін. У 756 папа Стэфан II атрымаў як дар ад франкскага караля Піпіна Кароткага Рымскую вобл., Равенскі экзархат, Пентаполіс і ў Сярэдняй І. стварылася царк. дзяржава — *Папская вобласць*. У 774 Лангабардскае каралеўства завалявалі франкі. У 800 Паўн. і Сярэдняя І. уключаны ў імперыю Карла Вялікага, у 962 увайшлі ў «Свяшчэнную Рымскую імперыю». У 11—12 ст. многія гарады сталі камунамі з самакіраваннем (Піза, Мілан, Асты, Лука і інш.). У гарадах-дзяржавах (Фларэнцыі, Сіене, Балоньі і інш.) у 14 ст. зарадзіліся раннекапіталіст. адносіны. Бязлітасная эксплуатацыя выклікала першыя выступленні наёмных рабочых (паўстанні ў Фларэнцыі 1345 і 1378, у Перуджы 1371). У 14 ст. адбыліся антыфеад. паўстанні сялян у паўн.-зах. І. (1304—07; 1382—87). Абвастрэнне класавай барацьбы выклікала змены ў паліт. ладзе італьян. дзяржаў. У многіх гарадах рэсп. рэжым заменены тыраніяй — адзінаўладдзем манарх. тыпу. Вузкая база раннекапіталіст. вытворчасці ў італьян. абласцях, перамяшэнне гандл. шляхоў з міжземнамор'я ў Атлантычны ак.— прычыны эканам. заняпаду Італьян. дзяржаў, які асабліва ўзмацніўся ў 2-й пал. 16 ст. Аслабленне краіны выкарысталі Іспанія і Францыя, якія ў 1494—1559 валявалі паміж сабой за панаванне ў І. У выніку Іспанія завалодала Паўд. І., Сіцыліяй, Сардзініяй, Міланскім герцагствам, астатнія італьян. дзяржавы (за выключэннем Венецыі, Савойскага герцагства з П'емонтам і Папскай вобласці) папалі ў залежнасць ад іх. У 1-й пал. 18 ст. тэр. І. стала арэнай войнаў паміж Францыяй, Аўстрыяй і Іспаніяй, у выніку якіх Паўн. і Сярэдняя І. апынуліся пад уладай Аўстрыі, Паўд. І. асталася ў залежнасці ад Іспаніі. У 2-й пал. 18 ст. на Пн І. ўзніклі маёнткі капіталіст. тыпу. Фарміраванне капіталізму і дзейнасць асветнікаў, якія выступалі супраць феад. парадкаў, спрыялі наступленню новай эпохі ў гісторыі І.— *Рысарджымента*, гал. змест ле — нац.-вызв. барацьба за ліквідацыю дзярж. раздробленасці і аўстр. панавання, за стварэнне адзінай нац. італьян. дзяржавы. У канцы 18 ст. ў І. ўзнікла сетка тайных арг-цый і клубаў. У антыфеад. і антыаўстрыйскім руху яны арыентаваліся на дапамогу рэвалюц. Францыі. Заваяванне І. Напалеонам і франц. панаванне (1796—1814) расчаравала італьян. нар. масы і бурж. колы. Нягледзячы на рэформы (адмена многіх унутр. таможных пошлін, цэхавых абмежаванняў, увядзенне прагрэс. напалеонаўскіх кодэксаў, ліквідацыя многіх феад. павіннасцей сялян і г. д.), развіццё нац. італьян. эканомікі стрымлівалася з-за грабежніцкай палітыкі заваёўнікаў, канкурэнцыі франц. тавараў. У краіне расло імкненне да нац. незалежнасці. Узніклі тайныя антыфранц. т-вы *карбанарыяў*. У 1813—14 успыхнулі вызв. паўстанні на Пд і ў Мілане. Пасля падзення напалеонаўскай імперыі *Венскі кангрэс 1814—15* замацаваў паліт. раздробленасць І. і панаванне Аўстрыі амаль на ўсёй тэр. краіны. У 1820—21 і ў 1831 адбыліся бурж. рэвалюцыі на чале з карбанарыямі. Аднак карбанарыі не мелі адзінай арг-цыі і праграмы, трывалых сувязей з нар. масамі. Гэта спрыяла паражэнню рэвалюцый.

Развіццё капіталізму патрабавала аб'яднання краіны. Яму перашкаджала аўстр. панаванне. У нац.-вызв. руху ўзніклі 2 кірункі: рэвалюц.-дэмакратычны (яго канцэпцыя, сфармуляваная Дж. *Мадзіні*, прадугледжвала аб'яднаць І. знізу ў незалежную рэспубліку) і памяркоўна-ліберальны (яго трымаліся буйная буржуазія і ліберальнае дваранства, якія, баючыся ўдзелу ў нац.-вызв. барацьбе нар. мас, выступалі за аб'яднанне зверху — праз рэформы італьян. манархаў і пават кампраміс з Аўстрыяй). У рэвалюцыю 1848—49 (гл. *Рэвалюцыі 1848—49*) в прычыны здрадніцтва памяркоўных і хістання дэмакратаў рэвалюц.-дэмакр. кірунак не перамог. Францыя і Аўстрыя ў саюзе з італьян. феад. рэакцыяй задушылі рэвалюцыю. *У аўстра-італа-французскую вайну 1859* ад аўстр. прыгнёту вызвалілася Ламбардыя. Гэта спрыяла рэвалюц. ўздыму мас. Перамаглі нар. паўстанні ў Модэне, Парме, Таскане і Раманьі. Аб'яднанню краіны садзейнічаў паход Дж. *Гарыбальдзі* з добраахвотнікамі на Пд краіны, дзе пачаліся сялянскія паўстанні. Аднак абмежаванасць італьян. рэвалюц. дэмакратыі, якая не ўзначаліла барацьбу сялян за зямлю, перашкодзіла закончыць рэвалюцыю знізу. Вызваленыя тэр. ў 1860 далучаны да П'емонта (Сардзінскага каралеўства). Утварылася італьян. каралеўства. Да яго ў выніку аўстра-італьянскай вайны 1866 далучылася Венецыя. Стварэнне адзінай італьян. дзяржавы закончана ў 1870 пасля далучэння Папскай вобл. і Рыма. У аб'яднанай І. устанавілася канстытуцыйная манархія. У апошняй трэці 19 ст. ў І. закончаны прамысл. пераварот. Эканоміка развівалася нераўнамерна. Пд адставаў ад перадавых раёнаў Пн і ператвараўся ў своеасаблівую ўнутр. калонію. Вырас рабочы клас, распаўсюджваліся сацыялiст. ідэі. У канцы 60 — пач. 70-х г. узніклі секцыі 1-га Інтэрнацыянала, у 1882 у Ламбардыі — Рабочая партыя. У 80—90 г. ўзмацнілася прапаганда марксісцкіх ідэй, у 1892 засн. італьян. сацыялiст. партыя (ІСП). Класавая барацьба абвастрылася ў пач. 20 ст., калі хуткімі тэмпамі ішло перарастанне капіталізму ў імперыялізм. Пад уплывам рускай рэвалюцыі 1905—07 адбыліся маніфестацыі, вабастоўкі, антываен. дэманстрацыі. У канцы 19 ст. І. стала на шлях калан. войнаў. У 1882 заключыла *Траісты саюз* з Германіяй і Аўстра-Венгрыяй, у 1889 акупавала Самалі, у 1890 Эрытрэю, у 1895—96 спрабавала ваяваць супраць Эфіопіі. У Італа-турэцкую вайну 1911—12 захапіла Лівію. Супярэчнасці з Германіяй і Аўстра-Венгрыяй з-за рынкаў збыту прымусілі І. выступіць супраць іх у 1-ю сусв. вайну.

Разруха, выкліканая вайной, і рэвалюц. рух, які асабліва пашырыўся пасля Вял. Кастр. сацыялiст. рэвалюцыі, прывялі краіну да востраго паліт. крызісу. І. ўключылася ў антысав.

паход Антанты, накіравала ўзбр. сілы ў Адэсу, Мурманск і Уладзівасток, імкнулася захапіць тэр. ў Турцыі і Албаніі. Гэта выклікала пратэст італьян. працоўных. У 1919 у стачках удзельнічала 1,7 млн., у 1920 — 2,3 млн. чал. У Турыне, дзе барацьбой рабочых кіравала група «Новы лад» на чале з А. *Грамшы*, масавы характар набыў рух фабрычна-заводскіх саветаў. Рабочыя І. займалі прадпрыемствы, сялянне захоплівалі зямлю; хваляванні ахапілі і армію. Пралетарыят прымусіў урад адмовіцца ад удзелу ў антысав. інтэрвенцыі, увесці 8-гадзінны працоўны дзень, павялічыць заработную плату і інш. Развіццё рэвалюц. працэсу сарвалі рэфармісцкія лідэры ІСП і Усеагульнай канфедэрацыі працы (засн. ў 1906), якія пайшлі на змову з буржуазіяй. Пасля расколу ІСП левыя сацыялісты ў студз. 1921 заснавалі Камуніст. партыю Італіі — КПІ (з 1943 *Італьянская камуністычная партыя* — ІКП). Пры падтрымцы буржуазіі ў кастр. 1922 у краіне ўстаноўлена фаш. дыктатура. Пачаўся тэрор супраць рэвалюц. рабочых, камуністаў. «Выключныя законы» 1926 забаранілі дзейнасць усіх паліт. партый (акрамя фашысцкай), прагрэс. прафсаюзаў, апазіц. друк. У 1929 урад Б. Мусаліні [1922—43] заключыў з Ватыканам пагадненне, якое забяспечыла фаш. рэжыму падтрымку царквы. Ва ўмовах тэрору кампартыя (працавала ў падполлі) змагалася супраць фашызму, стала цэнтрам групавання антыфаш. сіл. У сусв. эканам. крызіс 1929—33 колькасць беспрацоўных дасягнула 1 млн. чал., ішло збяднение сялян. Фаш. ўрад імкнуўся аздаравіць эканоміку расшырэннем дзярж. сектара ў прамысловасці. Гэта прывяло да стварэння 22 карпарацый, у якія ўваходзілі прадстаўнікі фаш. партыі, фаш. прафсаюзаў і прадпрымальніцкіх арг-цый. Створаная ў 1939 палата фаш. арг-цый і карпарацый замяніла парламент. Урад Мусаліні вёў агрэс. палітыку, у 1923 спрабаваў захапіць грэч. в-аў Корфу, у 1926 устаноўлены фактычны пратэктарат над Албаніяй, у 1936 акупавана Эфіопія (гл. *Італа-эфіопскія войны*). Разам з Германіяй І. ўдзельнічала ў інтэрвенцыі 1936—39 супраць Ісп. рэспублікі. У 1936 афармлены агрэс. ваен.-паліт. саюз паміж Германіяй і І. (гл. *«Вось Берлін — Рым»*), у 1937 І. далучылася да *«Антыкамінтэрнаўскага пакта»*, выйшла з *Лігі нацый*, 22.5.1939 заключыла саюзны дагавор з Германіяй, у крас. 1939 захапіла Албанію, у чэрв. 1940 уступіла ў 2-ю сусв. вайну. У кастр. 1940 І. напала на Грэцыю, у крас. 1941 на Югаславію, у чэрв. 1941 абвясціла вайну СССР. У канцы 1942 — пач. 1943 італьян. армія (10 дывізій) поўнасцю разгромлена пад Сталінградам і на Доне. У кастр. 1942 — маі 1943 італа-герм. войскі страцілі свае пазіцыі ў Паўн. Афрыцы. Англа-амер. войскі высадзіліся ў Сіцыліі. Перад пагрозай антыфаш. рэвалюцыі (усеаг. забастоўка ў сак. 1943) буйныя манапалісты, Ватыкан, каралеўскі двор, генералітэт і нават большасць лідэраў фаш. партыі выказаліся за адстаўку Мусаліні. Новы ўрад на чале з П. Бадольё падпісаў 3.9. 1943 акт пра капітуляцыю І. перад краінамі антыгітлераўскай кааліцыі. У адказ герм. войскі захапілі Рым, Паўн. і Цэнтр. І., стварылі на Пн краіны «рэспубліку Сало» на чале з Мусаліні. На акупаванай тэр. пад кіраўніцтвам ІКП разгарнуўся ўсенародны Рух Супраціўлення супраць гітлер. захопнікаў і італьян. фашыстаў. У партыз. арміі змагалася 256 тыс. байцоў, з іх больш за 153 тыс. камуністаў. У *Гарыбальдзійскіх брыгадах* было каля 5 тыс. сав. грамадзян, у т. л. беларусы. 22.4. 1944 створаны першы антыфаш. ўрад нац. адзінства (увайшлі прадстаўнікі ўсіх антыфаш. партый, у т. л. ІКП і ІСП). У выніку антыфаш. паўстання ў крас. 1945 вызвалена Паўн. І. Прысутнасць англа-амер. войск у краіне, падтрымка імі італьян. кансерватыўных сіл перашкодзіла ажыццявіць сац. праграму Супраціўлення: ліквідацыю манаполій і буйнога землеўладання, карэннае абнаўленне італьян. грамадства. Аднак дэмакр. сілы на чале з ІКП дамагліся важных сац.-эканам. пераўтварэнняў: нацыяналізацыі некат. галін прамысл., перадачы сялянам на часовае карыстанне памешчыцкіх земляў, якія не апрацоўваліся, прызнання правоў прафсаюзаў і г. д. У чэрв. 1946 у выніку рэферэндуму ліквідавана манархія, І. абвешчана рэспублікай. У 1947 прынята канстытуцыя, якая ў цэлым мела глыбока дэмакр. характар. У лют. 1947 І. падпісала з краінамі антыгітлераўскай кааліцыі мірны дагавор, які забараніў адраджэнне і дзейнасць фаш. арг-цый. І. адмаўлялася ад сваіх калоній, прызнала незалежнасць Албаніі і Эфіопіі.

У 1947 манапаліст. буржуазія перайшла ў наступленне. Камуністы і сацыялісты былі выведзены з урада. У 1948 большасць у палаце дэпутатаў атрымала Хрысціянска-дэмакр. партыя (ХДП), вакол якой кансалідаваліся кансерватыўныя сілы. Актывізавалася дзейнасць фаш. элементаў (аб'ядналіся ў партыю Італьян. сацыяльны рух). Яны арганізавалі (14.7.1948) замах на ген. сакратара ІКП П. *Тальяці*. Італьян. рабочыя адказалі на зла-

Расправа са студэнтамі, якія выступілі з патрабаваннем дэмакратызаваць сістэму вышэйшай адукацыі ў краіне. Рым. 1968.





Масавы антыфашысцкі мітынг працоўных Балоньі. 1971.

чынны акт рэакцыі ўсеагульнай забастоўкай. У 1948 І. далучылася да *Маршала плана*, у 1949 уступіла ў НАТО (гл. *Арганізацыя паўночнаатлантычнага дагавору*), у 1950 заключыла пагадненне з ЗША «пра ўзаемную дапамогу ў мэтах абароны», падпісала *Парыжскія пагадненні 1954*, у 1957 дагавор пра «Агульны рынак» (гл. *Еўрапейскае эканамічнае таварыства*), у 1959 пагадненне з ЗША пра буд-ва на тэр. І. амер. ракетных баз. ІКП выкрывала рэакц. палітыку пануючых колаў, выступала за згуртаванне працоўных у барацьбе за дэмакр. абнаўленне краіны. На выбарах у парламент 1958 камуністы сабралі 6,7 млн. галасоў. Сіла дэмакр. руху асабліва выявілася ў 1960, калі ўрад Ф. Тамброні [25.3—19.6.1960], які адкрыта патураў неафашыстам, мусіў пайсці ў адстаўку. 22.2.1962 сфарміраваны левацэнтрысцкі ўрад з прадстаўнікоў ХДП, Італьян. сацыял-дэмакр. партыі (ІСДП) і Італьян. рэсп. партый (ІРП). Ён пайшоў на некат. ўступкі працоўным (нацыяналізацыя электраэнергетычнай прамысл., рэформа пенсійнага забеспячэння і інш.). Рознагалоссі ўнутры партый урадавай кааліцыі па асн. пытаннях эканам. палітыкі прывялі яе да расколу. З мая 1968 да чэрв. 1970 змянілася 5 урадаў. У краіне не спыняецца востpая класавая барацьба. Рабочы рух набывае больш арганізаваны і баявы характар. Ва ўсеагульнай забастоўцы ў лютым 1969 удзельнічала 18 млн., у ліст. 1969 — 20 млн. чал. Адзіным фронтам выступаюць тры асн. прафсаюзныя аб'яднанні. Выбары ў абл. саветы (чэрв. 1970) закончыліся новым поспехам ІКП (26,8% галасоў), стварэннем левых выканаўчых органаў у абласцях Эмілія-Раманья, Таскана і Умбрыя. Мацнее згуртаванасць дэмакр. сіл, якія выступаюць за поўнае ажыццяўленне прынцыпаў канстытуцыі 1947, за паліт. і эканам. правы, прагрэс. сац. пераўтварэнні. У 1971 працоўныя І. далі рашучы адпор фаш. змове супраць рэспублікі.

І. — чл. ААН з 1955. Трымаецца палітыкі НАТО. Вызначылася некат. паляпшэнне адносін з Сав. Саюзам (дыпламат. адносіны з 1924, у 1941—44 перапынены), расшыраюцца гандаль, культ. сувязі. Значны ўклад у развіццё італа-сав. адносін робіць БССР. Беларусь пастаўляе ў І. трактары, станкі, атрымала з І. комплекснае абсталяванне для вытворчасці аміяку, пражы, сокаў садавіны. Прадукцыя бел. прадпрыемстваў экспанавалася на выстаўцы ў Мілане. Бел. т-ва дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі мае пастаянныя кантакты з т-вам «Італія — СССР». У гарадах І. наладжваліся выстаўкі бел. пар. творчасці, дзіцячага малюнка, а ў Мінску — выстаўка сучаснай італьян. графікі і маст. фатаграфіі. Ідзе абмен дэлегацыямі прадстаўнікоў грамадскасці, вучоных, груп турыстаў і інш.

Асноўныя палітычныя партыі і прафсаюзы. Хрысціянска-дэмакратычная партыя (ХДП). Засн. ў 1943; *Італьянская камуністычная партыя* (ІКП). Засн. ў 1921. 1507 тыс. чл. (1971), старшыня Л. Лонга, ген. сакратар Э. Берлінгуэр; Італьянская сацыялістычная партыя пралетарскага адзінства. Засн. ў 1964 левымі сацыялістамі, якія выйшлі з ІСП; Італьянская рэспубліканская партыя. Існуе з 1832; Італьянская ліберальная партыя. Засн. ў 1848; Італьянская сацыялістычная партыя (ІСП). Засн. ў 1966 у выніку аб'яднання Італьян. сацыяліст. партыі і Італьян. сацыял-дэмакр. партыі. Да кастр. 1968 — Аб'яднаная ІСП — ІСДП; Італьянская сацыял-дэмакратычная партыя. Засн. ў 1969 правымі сацыял-дэмакратамі і сацыялістамі, што адкалоліся ад ІСП; Італьянскі сацыяльны рух. Неафашысцкая партыя. Засн. ў 1947; Італьянская дэмакратычная партыя манархічнага адзінства. Засн. ў 1959; Усеагульная італьянская канфедэрацыя працы. Створана ў 1944. Уваходзіць у *Сусветную федэрацыю прафсаюзаў*; Італьянская канфедэрацыя прафсаюзаў працоўных. Засн. ў 1950, пад уплывам ХДП; Італьянскі саюз працы, сацыял-дэмакр. прафс. аб'яднанне. Створаны ў 1950. Уваходзяць у *Міжнародную канфедэрацыю свабодных прафсаюзаў*.

Гаспадарка. І. — развітая індустр.-аграрная краіна. Доля яе ў сусв. капіталіст. вытворчасці 3,7% (1970). Па аб'ёме прамысл. прадукцыі займае 6-е месца сярод капіталіст. краін. Пасля вайны італьян. прамысловасць развівалася даволі хутка, хоць у 1963—65 знаходзілася ў крызісным стане, у 1967 аб'ём яе прадукцыі ў 5 разоў перавысіў даваенны. Хуткі рост абумоўлены наплывам замежнага капіталу, пераважна ЗША і Швейцарыі, а таксама мілітарызацыяй краіны пасля ўступлення ў НАТО (ваенныя выдаткі ў 1959 склалі 1067 млн. долараў, у 1970 — 2416 млн.). Эканоміка І. знаходзіцца пад кантролем манапаліст. капіталу, цесна звязанага з замежным капіталам. 690 самых буйных кампаній (1,4% агульнай колькасці кампаній) валодаюць 72,8% акцыянернага капіталу. Прамыя замежныя інвестыцыі ў эканоміку І. склалі 33,3 млрд. лір (1969). Найб. манаполіі «ФІАТ» (аўта-

маб., трактарная і ваен. прамысл.), «Мантэдысан» (хім. і тэкст. прамысл.), ЭНІ (нафтахім. і тэкст.), «Італсідэр» (металургічная) і інш. Пасля 2-й сусв. вайны ў эканоміцы І. шырокае развіццё набыў дзярж.-манапаліст. сектар, на які ў 1967 прыпадала 13% рабочых і служачых і больш за 20% прамысл. вытворчасці. Нацыяналізаваны сродкі сувязі, чыгункі і вял. эл. станцыі. Утвораны дзярж. кампаніі ў нафтавай, металург., эл.-тэхн. прамысловасці. І. належыць 1-е месца ў капіталіст. свеце па здабычы ртуці і вытв. макаронаў, 2-е — па вытв. аліўкавага алею (36% сусв. вытв.) і вінаграднага віна, 3-е па здабычы пірытаў і збору цытрусавых.

Прамысловасць — аснoўная галіна гасп. І. Характарызуецца высокай канцэнтрацыяй вытворчасці і цэнтралізацыяй капіталу, моцна залежыць ад прывозу сыравіны і паліва. Дае 42,5% нац. даходу. З агульнай колькасці занятых (18 965 тыс. чал., 1969) на долю прамысловасці прыпадае 42,5%. У 1971 афіцыйна зарэгістравана 1020 тыс. беспрацоўных. ³/₄ прамысл. вытворчасці сканцэнтравана на Поўначы. Рост цяжкай прамысловасці ўзмацняе розніцу паміж прамысловай Поўначчу і с.-г. Поўднем — рэзервам таннай рабочай сілы. Даход на душу насельніцтва на Пн у 2 разы вышэй, чым на аграрным Пд. Паводле афіц. звестак, сярэдняя заработная плата рабочага ў 1968 склала 86,5 тыс. лір (пражытачны мінімум тыповай сям'і 115 тыс. лір) у месяц. Кошт жыцця няспынна расце. З 1959 да 1970 розначныя цэны павялічыліся на 48%. У І. найб. развіта машынабудаванне, хім., металургічная, харч. і тэкст. прамысловасць. Па вытв. прадукцыі 1-е месца належыць машынабудаванню (30% усёй прамысл. прадукцыі краіны). Развіты аўтамабіле-, самалёта- і прыладабудаванне, эл.-тэхніка. Найб. галіна машынабудавання — вытв. аўтамабіляў (1854 тыс. штук, 1970). 90% аўтамабіляў дае канцэрн «ФІАТ», яго асн. з-ды ў Турыне. Другі цэнтр аўтамабілебудавання Мілан. Там жа і вытв. шарыкападшыпнікаў, каля ¹/₃ якіх экспартуецца. ²/₃ прадпрыемстваў эл.-тэхнікі сканцэнтравана ў Ламбардыі (Мілан, Лоды), П'емонце (Турын) і Лігурыі (Генуя). Развіта прыладабудаванне і дакладная механіка. Суднабудаванне ў Генуі, Ліворна, Неапалі, Палерма, Трыесце, Спецыі. Хім. прамысловасць базіруецца на мясцовай сыравіне (пірыты, сера, кам. соль, прыродны газ) і прывазной (нафта, кам. вугаль, фасфарыты, каўчук). Нафтаперапр. і нафтахім. прамысловасць у 1969 перапрацавала 104,8 млн. *т* нафты. Чорная металургія працуе на імпартным вугалі, больш за палову на імпартнай жал. рудзе і металаломе. У 1970 выплаўлена (млн. *т*) сталі 17,3, чыгуну 8,3. Каляровая металургія (выплаўка цынку, свінцу, ртуці, алюмінію) развіваецца пераважна на мясцовай сыравіне. Слабае месца эканомікі — паліўная база: у 1970 здабыта 300 тыс. *т* кам. вугалю, 1,4 млн. *т* нафты, 13,2 млрд. *м*³ прыроднага газу. Паводле дагавору 1969 СССР па газаправодзе за 20 гадоў перадасць у І. 100 млрд. *м*³



Металургічны завод у Таранта.

газу. У энергабалансе краіны 71,3% прыпадае на вадкае паліва, 11,3 на цвёрдае, 9,8 на прыродны газ, 7 на эл. энергію ГЭС і 0,6% на эл. энергію АЭС. У 1970 выпрацавана 114,7 млрд. *квт·гадз* эл. энергіі, 38% даюць ГЭС на альпійскіх рэках. У І. пабудавана некалькі геатэрмічных эл. станцый, працуюць 3 АЭС агульнай магутнасцю каля 600 тыс. *квт*. Развіта тэкст. прамысловасць, вытв. баваўняных тканін і тканін з сінтэтычных валокнаў. Каля ¹/₃ тэкст. вырабаў экспартуецца. Асн. галіны харч. прамысловасці: мукамольная, вінаробная, маслабойная, цукровая, макаронная і тытунёвая. Прамысл. буд. матэрыялаў (асабліва цэментавая), шкляная, фарфора-фаянсавая, папяровая, гарбарная і інш.

Сельская гаспадарка. У ёй занята 21,2% самадзейнага насельніцтва, дае 11% нац. даходу. Апрацоўваецца 13,2 млн. *га* зямлі — 43,8% тэр. краіны. С. гасп. І. характэрны перажыткі феад. адносін і буйное памешчыцкае землеўладанне. Вял. гаспадаркі (больш за 1000 *га*) складаюць 1,4% ад усіх гаспадарак, але валодаюць 31% зямлі. У І. каля 1,5 млн. беззямельных сялян-арандатараў і 1,7 млн. батракоў. На Пн пашыраны гаспадаркі капіталіст. тыпу. Поўдзень — раён буйнога памешчыцкага землеўладання з латыфундыямі па 10—20 тыс. *га*. Памешчыкі здаюць зямлю ў арэнду. Большасць сяляне — здольшчыкі. Земляробства дае ²/₃ таварнай прадукцыі. Вылучаецца садоўніцтва, вінаградарства і агародніцтва. Значная частка прадукцыі гэтых галін ідзе на экспарт. Збор (млн. *т*, 1970) цытрусавых 2,5, масліны 2,1. Асн. збожжавыя культуры: пшаніца (збор 9,6 млн. *т*, 1970) і кукуруза (4,5 млн. *т*) — займаюць ⁴/₅ апрацаванай зямлі; на паліўных землях Ламбардыі і П'емонта рыс (819 тыс. *т*). З тэхн. сеюць цукр. буракі, тытунь, бавоўнік. На жывёлагадоўлю прыпадае 35% усяго кошту с.-г. прадукцыі. У 1970 было (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 9563, авечак 8206, свіней 9224. Спецыфічная галіна с. гасп. І. — атрыманне натур. шоўку.

Даўж. чыг. 20,3 тыс. *км*, з іх 9,4 тыс. *км* (1969) электрыфікавана; аўтастрад 3,6 тыс. *км* (1970). Вял. значэнне мае авіяц. і марскі транспарт. Танаж гандл. флоту 7,5 млн. бр. рэг. *т* (1970, ¹/₃ складаюць танкеры). Гал. порты: Генуя, Неапаль, Венецыя, Трыест, Савона, Ліворна. У 1970 экспарт склаў 8241 млрд. лір, імпарт 9337. І. вывозіць машыны, у т. л. аўтамабілі, абсталяванне, харч., тэкст. і трыкатажныя вырабы; прывозіць с.-г. прадукцыю, некаторыя віды абсталявання, нафту і нафтапрадукты, сыравіну для прамысловасці. Асн. партнёры ў гандлі: ФРГ, Францыя, ЗША, Вялікабрытанія. Расшыраюцца аб'ём гандлю і эканам. сувязі з СССР і інш. сацыяліст. краінамі. Грашовая адзінка — ліра.

Узброеныя сілы І. складаюцца з сухапутных войск (армія), ВПС і ВМС. Агульная колькасць (1970) каля 370 тыс. чал. Акрамя таго, ёсць войскі награн. аховы (больш за 40 тыс. чал.) і ваен. жандармерыі — войскі карабінераў (каля 75 тыс. чал.). Галоўнакамандуючы — прэзідэнт, вышэйшае ваен. кіраўніцтва ажыццяўляе Вышэйшы савет абароны і ваенны кабінет. Сухапутныя войскі (каля 270 тыс. чал.) уключаюць 1 армейскае ўпраўленне і 4 арм. корпусы. Усяго 7 дывізій (5 пяхотных і 2 бронетанкавыя), 11 асобных брыгад (4 пяхотныя, 5 альпійскіх, 1 бронекавалерыйская і 1 парашутная), некалькі дывізіёнаў ракетнай і зенітна-ракетнай артылерыі і інш. Большасць сухапутных войск перададзена ў склад аб'яднаных сіл НАТО. ВПС (каля 65 тыс. чал.) маюць больш як 300 баявых самалётаў і некалькі дывізіёнаў зенітных кіроўных ракет «Найк». У складзе ВМС (больш як 40 тыс. чал.) каля 200 караблёў і катэраў, у т. л. 4 крэйсеры, 6 эскадраных мінаносцаў, 10 дызельных падводных лодак і інш.

Ахова здароўя. Адзінай сістэмы аховы здароўя няма. Пераважае прыватная практыка ўрачоў. Лячэнне ў бальніцах платнае. У 1965 было 2,5 тыс. стацыянарных бальнічных устаноў на 503 тыс. ложкаў (9,8 на 1 тыс. ж.). Амаль палова бальнічных ложкаў запята хворымі на псіхічныя парушэнні. У 1965 было 87 300 урачоў (16,5 на 10 тыс. ж.), 15 тыс. стаматолагаў, 30,5 тыс. фармацэўтаў, 54 тыс. мед. сясцёр і акушэрак. Рыхтуюць урачоў на 22 мед. ф-тах ун-таў. У 1968 нараджальнасць 17,6, агульная смяротнасць 10,1, натуральны прырост 7,5 на 1 тыс. ж.; дзіцячая смяротнасць 32,8 на 1 тыс. жыванароджаных. Нявырашанае пытанне аховы здароўя — алкагалізм. На кожнага чал. ў Італіі ўжываецца штогод 12 *л* абс. алкаголю, на кожнага дарослага чал. больш як 20 *л*. Пашыраны туберкулёз, дзіцячыя інфекцыі, трахома, траўматызм, венерычныя хваробы, эпідэмічны гепатыт, брушны тыф, паратыфы.

Асвета, навуковыя ўстановы. Сістэма адукацыі І.: дашкольныя ўстановы для дзяцей 3—6 гадоў; 5-гадовая пач. школа; 3-гадовая ніжэйшая сярэдняя школа (на базе пач. школы); поўная сярэдняя агульнаадук. школа (5-гадовы класічны ліцэй і 5-гадовы рэальны ліцэй). Абавязковае навучанне 8-гадовае (уключае курс пач. і ніжэйшай школы), аднак з-за цяжкага матэрыяльнага становішча працоўных, недахопу школ у 1966/67 навучальным годзе ніжэйшыя сярэднія школы пакінула 41% дзяцей. Навучанне мае акрэслена класавы характар. Школьныя праграмы прасякнуты духам каталіцызму. Школы дзярж. і прыватныя. Большая частка прыватных навуч. устаноў утрымліваецца каталіцкімі арг-цыямі. Прагрэс сілы на чале з кампартыяй І. змагаюцца за дэмакратызацыю нар. асветы. У 1968/69 навуч. г. ў І. было 37 338 дзярж. пач. школ (4366,3 тыс. вучняў) і 2966 прыватных (339,8 тыс. вучняў); 7848 дзярж. ніжэйшых сярэдніх школ (1876,6 тыс. навучэнцаў) і 1024 прыватныя (105,3 тыс. навучэнцаў); 438 дзяржаўных класічных ліцэяў (167,6 тыс. чал.) і 262 прыватныя (30,9 тыс. чал.); 422 дзярж. рэальныя ліцэі (171,2 тыс. чал.) і 101 прыватны (14 тыс. чал.). Прафесійныя навуч. ўстановы: 3—5-гадовыя прафесійныя ін-ты; 2-гадовыя тэхн. школы (прыватныя); дзярж. і прыватныя мастацкія і муз. школы і ліцэі. ВНУ: у 1968 у І. было 25 ун-таў, 55 вышэйшых школ; найб. вядомыя ун-ты Балонскі (засн. ў 11 ст.), Рымскі (1303), Неапалітанскі (1224), Падуанскі (1222; у 1512 у ун-це атрымаў званне д-ра медыцыны Францыск Скарына). Самыя вялікія б-кі: у Рыме — Нац. цэнтр., б-ка ун-та, б-ка Палаты дэпутатаў; у Неапалі — Нац., б-ка ун-та; у Турыне — Нац. і б-ка АН; у Мілане — Нац. і б-ка Амбразіяна; нац. і універсітэцкія б-кі ў Балоньі, Палерма, Пізе і інш. У І. больш за 150 музеяў. Найбольшыя: у Рыме — Нац. музей і віла Джулія, Музей этнаграфіі і дагістар. перыяду, Галерэя ант. мастацтва, Нац. галерэя сучаснага мастацтва і інш.; нацыянальныя, археал. і маст. музеі, карцінныя галерэі ў Фларэнцыі, Месіне, Неапалі, Таранта і інш.

Навуковыя ўстановы: Нац. акадэмія дэі Ліпчэі, Нац. акадэмія ды Сан Лука, Нац. акадэмія с. гасп., Нац. акадэмія ўліку; акадэміі: мед. навук у Палерма; навук. л-ры і мастацтваў; Рымская музычная; аграрнай эканомікі і інш. НДІ і доследныя цэнтры: прыкладнога вылічэння; ультрагукаў; астрафізікі; электронных вылічальных машын; электрафізічны; метэаралогіі і атмасфернай фізікі; макрамалекулярны; мікрахвалевы; хімічны; прыкладной хіміі; структурнай хіміі; маторны; электронікі і далёкіх сувязяў; электрычных мадэляў; псіхалогіі; фізіягенетычны; нейраэмбрыялогіі; нейрафізіялогіі; глебавай хіміі; с.-г. машын; віруса раслін; крышталаграфіі; геалогіі Апенін; лесу; нізкіх тэмператур; тэкст. індустрыі і інш.

Друк, радыё, тэлебачанне. У І. выдаецца каля 100 штодзённых газет і больш за 70 ілюстраваных штотыднёвікаў. Найб. масавымі тыражамі выходзяць газеты: «Il Popolo» («Народ»), орган ХДП; «L'Unità» («Адзінства»), орган ІКП; «L'Avanti!» («Наперад!»), орган ІСП; «Il Giorno» («Дзень»), газ. манапаліст. буржуазіі; «Il Messaggero» («Веснік»), афіц. ўрадавая газета; «Il Tempo» («Час»), правая бурж. газета. Працуюць 30 інфармац. агенцтваў. Найб. Agenzia Nazionale Stampa Associata. Засн. групай італьян. газетна-час. выд-ваў на каап. аснове. Радыё-тэлевіз. кампанія (Radiotelevisione Italiana — RAI) манапалюецца дзяржавай.

Літаратура. У 6—12 ст. пісьмовая л-ра І. існавала на лац. мове (рэліг. гімны і легенды). Зберагліся літ. помнікі на нац. дыялектах з 12—13 ст. У 1-й пал. 13 ст. ўзнікла сіцылійская паэт. школа (Якопа да Ленціні і інш.), васн. на традыцыях правансальскіх трубадураў; у Таскане развівалася паліт. лірыка (Гвітоне д'Арэца і інш.) і алегорыка-дыдактычная паэзія (Брунета Латіні). Узор прозы 13 ст.— ананімны аб. на тасканскім дыялекце «Навеліна». Перадрэнесансавая філас. паэзія «Новага салодкага стылю» (канец 13 ст.) ажывала ўзвышанае каханне (Г. Гвініцэлі, Г. Кавальканці і інш.). Стваральнік італьян. літ. мовы, папярэднік л-ры Адраджэння *Дантэ* Алігьеры в вял. маст. сілай паставіў у «Боскай камедыі» (пач. 14 ст.) актуальныя праблемы таго часу, паказаў пачуцці і пакуты людзей. У 14 ст., раней за інш. краіны, у І. пачалася эпоха *Адраджэння*: паэзія Ф. *Петраркі* адзначаная тонкім псіхалагізмам, услаўляла зямное каханне; проза і паэзія Дж. *Бакачыо* ў процілегласць рэліг. аскетызму сцвярджала новую гуманіст. мараль. У 15 ст. ідэі Адраджэння прадоўжаны т. зв. вучонымі-гуманістамі (Дж. Ф. П. Брачаліні, Л. Вала), паэтамі гуртка Медычы (Ларэнца Медычы, А. Паліцыяна, Л. Пульчы). У 16 ст. гуманіст. светаадчуванне ўласціва рыцарскай паэме М. *Баярда* «Закаханы Раланд», пастаральнаму раману Я. Санадзара «Аркадыя», паэме Л. *Арыёста* «Неўтаймаваны Раланд». Бытавую сатыр. камедыю, створаную Арыёста, развівалі Н. Макіявелі,

Сіцылія. Збор бавоўны.



П. *Арэціна*, Дж. Бруна; пастаральную драму — Т. *Таса*, Б. Гварыні. У прозе 16 ст. вылучаліся Т. *Таса*, Б. Гварыні, Б. Кастыльёне, Б. Чэліні, А. Фірэнцуола, М. Бандэла; у лірыцы — эпігоны Петраркі на чале з П. Бемба. У паэзіі Таса адлюстраваны трагічныя супярэчнасці паміж гуманіст. ідэаламі і рэлігсупярэчнасці паміж гуманіст. ідэаламі і рэлігаскетычнымі поглядамі. Феад. рэакцыя выявілася ў барочнай паэзіі Дж. Марына і яго паслядоўнікаў, супраць якіх выступілі паэт і драматург Г. К'яброра і паэт А. Тасоні. У 18 ст. развіваліся класіцызм (трагедыі П. Я. Мартэла і Ш. Мафеі), галантная паэзія ракако. Абодва кірункі перапляліся ў творчасці лірыка і драматурга П. Метастазіо. Асветніцтва ў І. пачалося ў сярэдзіне 18 ст. Драматург К. *Гальдоні* выступіў пачынальнікам рэаліст. камедыі характараў. Яго ідэйны праціўнік К. Гоцы высмейваў асветніцкі рацыяналізм. Грамадз. пафасам прасякнуты тырананенавісніцкія трагедыі В. *Альф'еры*. Асветніцкія ідэі ўласцівыя і паэту Дж. Парыні. Л-ра Рысарджымента (канец 18 ст.— 1870) пачалася ў творчасці В. Монці і Н. У. Фоскала. На мяжы 10—20-х г. 19 ст. ўзнік рамантызм (публіцыстыка Дж. Бершэ, Л. Ды Брэме, А. Мандзоні). Пачатак нац.-вызв. руху адлюстраваны ў лірыцы Бершэ, мемуарах С. Пеліка. Глыбокі патрыятызм і рамант. адчай вылучаны ў лірыцы Дж. *Леапардзі*. Пачынальнік гістар. рамана — А. Мандзоні. У 30—40-я г. паявіліся гістар. раманы Ф. Д. Гверацы, трагедыі Дж. Нікаліні, лірыка Г. Мамелі і А. Пазрыо, прасякнутыя рэвалюц. ідэямі Дж. Мадзіні; расквітнела сатыр. паэзія фларэнтыйца Дж. Джусці і рымляніна Дж. Белі. Пасля бурж. рэв. 1848—49 вылучылася творчасць паэтаў-гарыбальдзійцаў А. Алеардзі, Л. Мерканціні. У гістар. рамане гарыбальдзійца І. Ньева «Споведзь італьянца» (1858) намеціўся пераход да рэалізму. Ідэі Рысарджымента выразна гучалі ў паліт. паэзіі Дж. *Кардучы*. Асн. рэаліст. плынь пасля 1870 — верызм — адлюстроўвала сац. рэчаіснасць, побыт «маленькіх людзей». Пісьменнік-верыст Дж. *Верга* ў раманах, навелах і драмах спачувальна паказаў жыццё рыбакоў і сялян, высмейваў духавенства і багацеяў. Прадстаўнікі верызму — крытык і раманіст Л. Капуана, раманіст Грацыя Дэледа, драматургі Дж. Джакоза, М. Прага. Пісьменнік-сацыяліст Э. Дэ Амічыс сцвярджаў дэмакр. і гуманіст. ідэалы. У канцы 19 ст. ўзніклі неарамантычны (раманіст А. Фагацара, драматург С. Бенелі) і сімвалісцкі (паэт Дж. Паскалі) дэкадэнцкія кірункі. Характэрная прыкмета дэкадансу і ніцшэанства — эстэцкія і геданістычныя вершы і раманы Г. Д'Анунцыо, які ўсхваляў імперыялізм і фашызм. Трагедыю «маленькага чалавека» ў бурж. свеце расчыніў празаік і драматург Л. Пірандэла. Пасля 1-й сусв. вайны ў прагрэсіўнасць і дэкадэнцкім плыням левае крыло інтэлігенцыі на чале з А. *Грамшы* і антыфаш. публіцыстам П. Габелі ў цяжкіх умовах фашызму, які ліквідаваў у 1926 усю легальную прэсу І., адстойвалі дэмакр. л-ру. Гады фаш. дыктатуры прывялі л-ру І. да адыходу ад сац. тэматыкі і рэаліст. традыцый. У паэзіі 20—30-х г. панавала фармаліст. плынь — «герметызм» а матывамі адзіноты, трагічным адчуваннем свету (Дж. Унгарэці, Э. Мантале, У. Саба); рэаліст. традыцыі прадоўжаны ў прозе К. Альвара, А. *Маравія*, пісьменнікаў антыфаш. эміграцыі — Дж. Джэрманета, А. Угаліні. У 30-я г. ўзмацніліся антыфаш. перакананні Ч. Павезе, Маравія, Э. Вітарыні. Усенародны Рух Супраціўлення 1943—45 прывёў да ўзнікнення рэаліст. кірунку — неарэалізму, якому характэрны антыфаш. настрой, вера ў чалавека з народу, імкненне да праўдзівага паказу жыцця (проза Вітарыні, Р. Вігано, К. Калоны, В. *Праталіні*, Ф. Іовіне, К. Леві; мемуарная ліпа; паэзія С. Квазімада, П. П. Пазаліні; кінадраматургія Ч. Дзаванціні, Пазаліні, Дж. Басані). Прагрэс. л-ру для дзяцей, заснаваную на пар. традыцыях, стварае паэт і казачнік Дж. *Радары*. У канцы 50-х г. выявіліся ідэйна-маст. абмежаванасці неарэалізму, некат. пісьменнікі-неарэалісты падпалі пад уплыў мадэрнізму. Творчасці прагрэс. пісьменнікаў 60-х г. уласцівы глыбіня псіхалагізму і пашырэнне сац. сферы адлюстравання рэчаіснасці. Асаблівае развіццё атрымаў сац.-псіхалаг. раман. Актуальныя філас., сац. і маральна-этычныя праблемы, вострае выкрыццё заганаў бурж. грамадства ўласцівы прозе Маравія, І. Кальвіна, Г. Парызе. Тэматыка вайны і Супраціўлення глыбока раскрыта ў раманах Касолы, М. Вентуры і інш. У шэрагу твораў падымаецца тэма рабочага класа (Праталіні і інш.). ІКП аддае вял. ўвагу распрацоўцы праблем матэрыялісг. эстэтыкі.

Асобнымі выданнямі выйшлі на бел. мове: «Прыгоды К'ядзіна» (1959) М. Арджылі і Г. Парка, «Лішнія» (1965) Д. Арфелі, «Юнацтва становіцца ў строй» (1960) В. Берціні, «Вожыкава дрэва» (1958) А. Грамшы, «Спартак» (1938) Р. Джаваньёлі, «Запіскі цырульніка» (1932) Дж. Джэрманета, «Неапаль без сонца» (1955) і «Прыгоды Чыпаліна» (1957) Дж. Радары, «Праўдзівая гісторыя» (1957) Л. Стурані. У бел. перыёдыцы друкаваліся пераклады з паасобных твораў Д'Алесандра Альда, Дж. Арпіна, А. Артазе, Д. Арфелі, К. Бернары, Дантэ, Дж. Кардучы, Дж. Канфаланьеры, С. Квазімада, А. Маравія, А. Негры, З. Нікаліні, Ч. Павезе, Ф. Петраркі, Дж. Радары, У. Ронфані, Д. Рэа, Р. Рэпета, А. Северыні, М. Серэні, М. Фраці і інш.

Архітэктура І. зрабіла выключны ўплыў на фарміраванне еўрап. архітэктуры, на тыпы збудаванняў (цэрквы базілікальнай, цэнтрычнай кампазіцыі, палацы, грамадскія будынкі), на выразныя сродкі (ордэры), на горадабудаўніцтва (прамавугольная, трохпрамяневая планіроўка) і паркі (партэры, фантаны, каскады). Культуры, што развіваліся на тэр. І., пачынаючы з эпохі этрускаў, грэч. каланізацыі, ант. Рыма (гл. Рым Старажытны) і раннехрысціянскай эпохі (цэнтры — Рым, Равена), пакінулі шматлікія першакласныя помнікі. У час феад. раздробленасці складваюцца мясцовыя школы раманскай архітэктуры (11—13 ст.) — ламбардская (базіліка Сант-Амброджа ў Мілане), таскансная («інкрустацыйны» стыль), венецыянская, рымская, сіцылійская (спалучала візант., араб., нарманскія ўплывы) і інш. З развіццём незалежных гарадоў-дзяржаў (Сан-Джымініяна) фарміруюцца тыпы будынкаў гарадскіх самакіраванняў (Сіена, Фларэнцыя), умацаванага жылля (вежы Балоньі), саборнага храма (св. Марка ў Венецыі), часам з кампанілай і баптыстэрыем (комплекс у Пізе). Гатычны стыль (14 ст.) выявіўся ў стральчатых формах аркадаў, праёмаў і ў дэкоры, а ў прасторавай і тэктанічнай структуры збудаванняў асталіся спакой і яснасць, што ішлі ад ант. традыцый (ц. Санта-Крочэ ў Фларэнцыі). Архітэктура *Адраджэння* ўзнікла ў 15 ст. ў Фларэнцыі, дасягнула росквіту ў Рыме і пашырылася ў 16 ст. ва ўсёй І. У ёй знайшлі аллюстраванне рацыяналізм і гуманіст. ідэалы новага класа — буржуазіі. Палацы, храмы, гарадскія грамадскія і фартыфікацыйныя збудаванні вызначаліся высакароднай веліччу арх. вобразаў. Палуляецца тып архітэктара-універсала: Ф. *Брунелескі*, Д. *Браманцэ*, *Мікеланджэла*, А. *Паладыо*, чыя творчасць аказала вял. ўплыў на сусв. архітэктуру. Эканам. заняпад і феад.-каталіцкая рэакцыя стварылі ўмовы для ўзнікнення ў 2-й пал. 16 ст. пышнага, пабудаванага на дынамічных і святлоценевых эфектах стылю *барока*, вакліканага ўзвысіць у вачах мас царкву і арыстакратыю (найб. значныя майстры барока Л. *Берніні*, Ф. *Барамініі*, К. Райнальдзі, Г. Гварыні). Горадабудаўнічыя дасягненні 17 ст.— сістэма па-мастацку ўзаемазвязаных вуліц і плошчаў — развіваліся ў эпоху класіцызму, які вярнуўся да спакойных ордэрных кампазіцый будынкаў. У 2-й пал. 19 ст. з развіццём капіталізму і аб'яднаннем І. пачынаецца прамысл. рост гарадоў (Турын, Мілан). У Рыме ствараюцца вял. жылыя раёны даходных дамоў, цяжкія будынкі грамадскіх і дзярж. устаноў, манументы. У пач. 20 ст. на змену эклектыцы прыходзяць «мадэрн» (у І. ён завецца стыль «ліберці») і футурызм з яго фантаст. праектамі гарадоў будучыні (А. Сант-Элія). У перыяд фашызму развіваецца афіц. манументальная архітэктура (неакласіцызм М. П'яченціні). У процівагу ёй складваецца плынь рацыяналістаў (Дж. Тэраны, Дж. Мікелучы, П. Л. *Нерві*), якія шукаюць сродкаў выразнасці і прасторавай арганізацыі для новых функцыянальных тыпаў будынкаў з жалезабетону. Пасля разгрому фашызму, з дэмакратызацыяй грамадскага жыцця пачынаецца новы перыяд уздыму італьян. архітэктуры. Шмат якія збудаванні 50—60-х г. вызначаюцца функцыянальнасцю і своеасаблівасцю прасторавых вырашэнняў, наватарствам і арыгінальнасцю канструкцый, абвостранай пластыкай кампазіцыі (вакзал Тэрміні, Палацэта ў Рыме, будынак Пірэлі ў Мілане, Палац працы ў Турыне). Горадабудаўнічыя



1



2



3



4

Італія І.
1. Горы ў цэнтральнай частцы Сіцыліі.
2. Курорт Капры на аднайменным востраве на поўдні Неапалітанскага заліва.
3. Від на тэрасаваныя схілы гор у вобласці Лігурыя з боку Лігурыйскага мора.
4. Рыбацкія лодкі ў порце Равена на Адрыятычным моры.
5. Агульны выгляд аўтамабільнага завода ФІАТ у Турыне.
6. Міжгорная даліна Аоста ў Заходніх Альпах.
7. Суднабудаўнічая верф ў Анконе на Адрыятычным моры.
8. Апрацоўка глебы пад вінаграднік у вобласці Таскана.



5



6



7



8



1



2



3



1



2



3



4



5

Італія II.

1. Фларэнцыя. Агульны выгляд.
2. Рым. Раён універсальнай выстаўкі.
3. Фестываль газеты «Уніта» ў Фларэнцыі. 1970.
4. Генуя. Агульны выгляд горада.
5. Палерма. Від з мора.
6. «Сяляне не хочуць памірацъ з голаду» — з такім лозунгам прайшлі па вуліцах Рыма шматтысячныя калоны сялян, якія прыехалі ў сталіцу з усіх канцоў краіны. 1971.

Італія III. 1. Сабор у Сіене. 1284—1376. 2. Сіксцінская капэла ў Ватыкане (фрэскі Мікеланджэла 1508—12 і 1536—41). 3. Д. Брамантэ. Царква Санта-Марыя дэле Грацые. Мілан. 1492—97. 4. Ф. Брунелескі. Капэла Пацы пры ц. Санта-Крочэ. Фларэнцыя. Пачата ў 1429. 5. А. Паладыо. Віла «Ратонда» каля Вічэнцы. 1551—67. 6. Сабор і пл. св. Пятра ў Рыме. Аэрафотаздымка. 7. Дж. Понці, П. Л. Нерві і інш. Будынак фірмы Пірэлі. Мілан. 1956—60. 8. П. Л. Нерві, А. Вітэлоцы. Палацэта, Інтэр'ер. Рым. 1956—57.



4



5



6



6



7



8







Італія IV. 1. Рафаэль. Сіксцінская мадонна. 1515—19. Карцінная галерэя. Дрэздэн. 2. Мікеланджэла. Майсей. 1515—16. Ц. Сан-П'етра ін Вінколі. Рым. 3. Тыцыян. Іпаліта Рыміньдзі. Фрагмент. Каля 1548. Галерэя Палаціна. Фларэнцыя. 4. С. Батычэлі. Нараджэнне Венеры. Фрагмент. Каля 1483—84. Галерэя Уфіцы. Фларэнцыя. 5. Леанарда да Вінчы. Тайная вячэра. 1495—97. Трапезная манастыра Санта-Марыя дэле Грацые. Мілан. 6. М. Караваджа. Апостал Павел. 1601. Ц. Санта-Марыя дэль Попала. Рым. 7. П. Веранезе. Трыумф Венецыі. 1580—85. Палац дожаў. Венецыя. 8. Р. Гутуза. Дзяўчына спявае «Інтэрнацыянал». 1953. Зборы С. Амідэі.





работы вядуцца з улікам гістар. забудовы і ландшафту (раён ЭУР і рэканструкцыя цэнтра ў Рыме, абсталяванне ўзбярэжжа для турызму). Разам з тым, жылыя раёны для рабочых у вял. прамысл. комплексах маюць невыразную, цесную забудову, у іх няма абслуговых устаноў (Агрыджэнта, Сіракузы, Матэра). Іл. гл. на ўкл. III да гэтага арт. і да арт. *Адраджэнне* (укл. I), *Архітэктура* (укл. II, III), *Барока*.

Выяўленчае мастацтва. Жывапіс 8—11 ст. (фрэскі, мазаікі) асноўваўся пераважна на познаант. узорах, агрубляў і спрашчаў іх. У 12—13 ст. у Сіцылії і Венецыі ствараліся мазаікі, блізкія да візантыйскіх (у Капэле Палаціна ў Палерма і інш.). З канца 12 ст. пашырыўся рэліг. станковы жывапіс. На мяжы 11—12 ст. Паўн. І. стала адным з цэнтраў фарміравання скульптуры раманскага стылю. У 12—13 ст. у дэкар. мастацтве Рыма і Тасканы шырока ўжываецца спалучэнне разьбы з паліхромнай мармуровай (часам смальтавай) інкрустацыяй (арнаментыка фасадаў, падлог, царк. кафедраў); майстры з сям'і Касмаці, Гвідэта да Кома). У 2-й пал. 13 — пач. 14 ст. ў мастацтве перадавых гарадоў Тасканы паявіліся рэаліст. свецкія тэндэнцыі, якія апіраліся пераважна на ант. традыцыі (гл. *Протарэнесанс*); гал. прадстаўнікі гэтага кірунку: скульптары Нікало і Джавані Пізана, Арнольфа ды Камбіо, жывапісцы П. Каваліні і *Джота* — вял. наватар, у драмат. фрэсках якога адбілася рэальнае жыццё. Готыка (14 ст.) у выяўл. мастацтве І. не атрымала шырокага развіцця. У 15 ст. з узмацненнем пазіцый буржуазіі ўзнікла і развілося ў Фларэнцыі (гл. *Фларэнційская школа*), а потым у інш. гарадах рэаліст. мастацтва *Адраджэння*, якое парвала з сярэдневяковай умоўнасцю (скульптары *Данатэла*, Л. Гіберці, Якопа дэла Кверча, Лука дэла Робія, А. *Верок'ё*; жывапісцы *Мазачыо*, *Гірландайо*, С. *Батычэлі*, П'ера дэла Франчэска, А. *Мантэнья*, Дж. Бэліні). У канцы 15 — 1-й чвэрці 16 ст. мастацтва Адраджэння дасягнула кульмінацыйнай ступені — стварыла абагульнены вобраз чалавека як цэнтра сусвету і ўвасобіла ў ім гуманіст. ідэі эпохі. Гал. цэнтрамі мастацтва гэтага перыяду (т. зв. Высокага Адраджэння) былі Фларэнцыя, Рым і Венецыя, найб. значныя майстры — *Леанарда да Вінчы*, *Рафаэль*, *Джарджоне*, *Тыцыян*, *Мікеланджэла*, *Караджа*. З эканам. заняпадам і феад. рэакцыяй у 20—80-я г. 16 ст. ў культуры І. паявіліся крызісныя рысы. Развілося вытанчана суб'ектыўнае мастацтва *маньерызму* (скульпт. Б. Чэліні, Джамбалонья, жывапісцы Панторма, Ф. Парміджаніна, А. Бранзіна), яму процістаяла мастацтва Позняга Адраджэння, якое асэнсоўвала драматызм эпохі з гуманіст. пазіцый (П. *Веранезе*, Я. *Тынтарэта*, Я. Басана, позняя творчасць Мікеланджэла, Тыцыяна). У 15—16 ст. высокага маст. ўзроўню дасягнулі ў І. малюнак, гравюра, дэкар.-прыкладное мастацтва (мэбля, маёлікa, шкло). У канцы 16—18 ст. панаваў стыль *барока*. У яго ранні перыяд развіваліся тэндэнцыі акадэмізму (*балонская школа* жывапісу на чале з братамі Карачы), якім процістаяла дэмакр., мужна-рэалістычнае мастацтва М. *Караваджа* і яго паслядоўнікаў. З 20-х г. 17 ст. мастацтва барока набывае дэкар. размах, напаўняецца бурлівай дынамікай і драмат. патэтыкай (скульптура Л. *Берніні*, ілюзіяністычны плафонны жывапіс П'етра да Картона, А. Поцца). Паўслядзённая рэальнасць адбілася ў работах Б. Строцы, Д. Феці, С. Розы, Дж. Крэспі і інш. жывапісцаў 17—18 ст. Новага ўздыму дасягнула ў 18 ст. венецыянская школа жывапісу (творы Дж. Б. *Цьепала*, пейзажы А. Каналета і Ф. Гвардзі), якая спалучала дэкаратывізм барока з традыц. венецыянскім каларызмам і аплярэдзіла пленэрныя пошукі 19 ст. На мяжы 19 ст. гал. кірункам італьян. мастацтва становіцца класіцызм (скульпт. А. Канова), які ў адсталай І. меў акадэмічны характар і быў пазбаўлены грамадз. пафасу. У час уздыму нац.-вызв. руху ў італьян. выяўл. мастацтве выявіліся тэндэнцыі рамантызму і дэмакр. рэалізму. У 20 ст. І. стала адным з цэнтраў сусв. авангардызму — маст. руху, у якім адбіліся складаныя супярэчнасці крызісу бурж. культуры (прадстаўнік «парыжскай школы» А. Мадыльяні і інш.). Рысы авангардызму асабліва моцна праявіліся ў мадэрнісцкіх плынях — футурызме (У. Бачоні), «метафізічным жывапісе» (Дж. Дэ Кірыка), фавізме, кубізме, сюррэалізме і інш. У перыяд фаш. дыктатуры развіваліся неакласічныя тэндэнцыі, фаш. кіраўніцтва ўкараняла псеўдаманументальнае агітац. мастацтва, якое ўслаўляла «новы лад». Пасля 2-й сусв. вайны ў І. ў барацьбе з фармалізмам, плынямі паявіліся яркія разнавіднасці сучаснага прагрэс. рэалізму (жывапіс Р. *Гутуза*, скульптура Дж. *Манцу*). Іл. гл. таксама на ўкл. IV да гэтага арт. і да арт. *Адраджэнне* (укл. II), *Барока*, *Батальны жанр* (укл. I), *Гістарычны жанр* (укл. I).

Музыка І. на працягу сваёй гісторыі — ад ранніх формаў літургіі (4 ст.) да песень Супраціў-




Данатэла. Давід. Бронза. 30-я г. 15 ст. Нац. музей. Фларэнцыя (злева). Дж. Манцу. Смерць гвалтоўная. Гліняная мадэль рэльефа для «Варот смерці» сабора св. Пятра ў Рыме. 1949—64.

Уверсе: Мазачыо. Цуд са стацірам. Фрэска ў капэле Бранкачы царквы Санта-Марыя дэль Кармінe ў Фларэнцыі. 1427—28. Унізе: П'ера дэла Франчэска. Партрэт герцага Урбінскага Федэрыга да Мантэфельтра. Каля 1465. Галерэя Уфіцы. Фларэнцыя (злева). Караджа. Пакланенне пастухоў (Ноч). Каля 1530. Карцінная галерэя. Дрэздэн.





лення — жывілася фальклорнымі вытокамі. З танцаў папулярныя сальтарэла, ламбарда, тарантэла, сіцыліяна, з песень — баркарола, неапалітанская песня і інш. У 6—7 ст. у Рыме створаны грыгарыянскі харал, які стаў асновай культавай музыкі Зах. Еўропы. *Гвіда д'Арэцца* (11 ст.) адзейсніў рэформу нотнага пісьма (пераход ад неўмаў да лінейнай натацыі). Адна з ранніх праяў Адраджэння ў музыцы І.— прагрэсіўны кірунак «Ars nova» («Новае мастацтва», гал. прадстаўнік Ф. Ландзіна, Фларэнцыя, 14 ст.), які даў пачатак росквіту свецкіх лірычных (мадрыгал, балата) і жанравых (кача) песень, інстр. музыкі. У эпоху Адраджэння ўзмацніўся ўплыў нар. музыкі, развілося свецкае мастацтва, значных поспехаў дасягнула тэарэт. думка (Дж. Царліна — заснавальнік вучэння пра гармонію), паявіліся муз. акадэміі («Санта-Чэчылія» ў Рыме, 1566), быў вынайдзены нотны друк (А. Петручы, 1498). Свецкія вак. жанры 15 ст.— фроталы, віланелы, дзе ў адрозненне ад складанай поліфаніі італьян. царк. музыкі сцвярджаўся гамафонна-гарманічны склад. У 16—17 ст. у свецкай музыцы асн. месца займаў мадрыгал, які ператварыўся ў вак. паэму 4 або 5-галосага складу (А. Віларт, Л. Марэнца, К. Джэзуальда ды Веноза). У 16 ст. фарміруюцца поліфанічныя школы — рымская на чале з *Палестрынам* і венецыянская (заснавальнік А. Віларт, найб. значныя майстры А. і Дж. *Габрыэлі*). На мяжы 16—17 ст. узнікаюць жанры оперы, араторыі, кантаты, канцоны, у якіх замацоўваецца гамафонія. Высокамаст. ўзоры араторый і кантат стварылі Дж. Карысімі, А. Страдэла. Першая опера («Дафна», муз. Я. Перы, тэкст А. Рынучыні) пастаўлена ў Фларэнцыі ў 1597. У пач. 17 ст. опера пашырылася па ўсёй Італіі. К. *Мантэвердзі*, першы класік оперы, заснаваў венецыянскую оперную школу. Да яе належалі Ф. Кавалі, М. А. Чэсці. На мяжы 17—18 ст. вылучылася неапалітанская оперная школа на чале з А. Скарлаці. Яна культывавала жанр оперы-серыя («сур'ёзнай оперы»), дзе дасягнула высокай дасканаласці мастацтва сольных спеваў — бельканта. З цягам часу ў гэтых операх на першы план вылучылася вонкавая віртуознасць, опера ператварылася ў «канцэрт у касцюмах». Больш познія прадстаўнікі школы (Н. Іамелі, Т. Траэта) імкнуліся пераадолець выпрацаваныя штампы. У сярэдзіне 18 ст. ў Неапалі і Венецыі склаўся новы жанр — опера-буфа (каміч. опера), які прынёс у оперу яркую характарыстычнасць, элементы сац. сатыры. Найб. вядомыя яе майстры Дж. Пергалезі, Н. Пічыні, Дж. Паізіела, Д. Чымароза (неапалітанская оперная школа), Б. Галупі (венецыянская школа). У 18 ст. адкрываюцца новыя оперныя т-ры, у т. л. «Сан-Карла» ў Неапалі, «Ла Скала» ў Мілане, «Фенічэ» ў Венецыі. У І. развіваецца і інстр. музыка. Пачынаючы з 16 ст., асабліва ў 17—18 ст. дасягае росквіту лютневае (Франчэска да Мілана, В. Галілей), арганнае (Дж. Фрэскабальдзі), клавірнае (Д. Скарлаці) мастацтва. Кампазітары-выканаўцы на чале з А. *Карэлі*, А. *Вівальдзі*, Дж. *Тарціні* залажылі асновы новых цыклічных формаў, стварылі жанры сольнага і ансамблева-аркестравага канцэрта (канчэрта гроса). Выдатны майстар сімф. і камернай музыкі 18 ст. Л. Бакерыні. Пачынаючы з 15 ст. развілося мастацтва вырабу смыковых інструментаў (лепшыя створаны ў 16—18 ст. прадстаўнікамі сем'яў *Амаці*, *Гварнеры*, *Страдывары*). У пач. 18 ст. Б. Крыстофары вынайшаў фартэп'яна (малаточкавы клавір). На мяжы 18—19 ст. вылучаюцца Н. *Паганіні* — найвыдатнейшы скрыпач, аўтар рамант. скрыпічных п'ес, і М. Клеменці, аўтар фп. санат, заснавальнік лонданскай піяністычнай школы. У далейшым дасягненні італьян. кампазітараў звязаны з оперным мастацтвам, якое развілося пад непасрэдным уплывам грамадска-паліт. жыцця. У перыяд Рысарджымента лепшыя прадстаўнікі оперы адгукваліся на свабодалюбныя імкненні сучаснікаў («Вільгельм Тэль» Дж. *Расіні* і інш.). Прадстаўнікі рамант. кірунку — В. *Беліні*, Г. *Даніцэці*. Адной з вяршынь опернага рэалізму стала творчасць Дж. *Вердзі*. У канцы 19 ст. ў італьян. оперы склаўся новы кірунак — верызм (Р. *Леанкавала*, П. Масканьі і найб. значны майстар Дж. *Пучыні*). У творчасці шэрагу кампазітараў 20 ст., у т. л. А. *Рэспігі*, Дж. Ф. Маліп'ера, выявіліся рысы імпрэсіянізму і неакласіцызму. Адным з прыхільнікаў мадэрнізму быў А. Казела. На музыцы І. згубна адбілася фаш. дыктатура, якая абвастрыла рэакц. тэндэнцыі, пачала ганенні многіх вядомых музыкантаў. Пасля 2-й сусв. вайны пашырыліся фармалістычныя авангардысцкія плыні, у т. л. алеаторыка, канкрэтная музыка. Некат. авангардысты (Л. Нона, Л. Далапікала) супярэчліва спалучаюць у сваёй творчасці сац. тэматыку, гуманіст. ідэі з ужываннем незразумелых дэмакр. аўдыторыі муз. сродкаў (дадэкафоніі, серыйнай тэхнікі). Сусв. славу набыла ў 18—20 ст. італьян. школа спеваў. Вял. ўклад у муз. культуру зрабілі дырыжор А. *Тасканіні*, піяніст і кампазітар Ф. *Бузоні*. З вядомых сучасных музыкантаў: дырыжоры Т. Серафін, В. Дэ Сабата, В. Ферэра, К. Цэкі, піяніст А. Бенедэці Мікеланджэлі, скрыпач З. Франчэскаці.

Тэатр. Тэатр. мастацтва І. паходзіць ад нар. абрадаў і гульняў, масленічных карнавалаў, паказаў мімаў. У сярэднія вякі ўзнікла літургічная драма і містэрыя, у якія прасочваліся камед.-сатырычныя матывы. У эпоху Адраджэння пачалося развіццё новай тэатр. культуры. Распрацоўваецца тэорыя гуманіст. драмы, прынцыпы дэкарацыйнага афармлення, паяўляюцца новыя жанры, будуюцца спец. тэатр. памяшканні. У сярэдзіне 16 ст. на аснове нар. творчасці ўзнікла імправізацыйная *камедыя дэль артэ* (камедыя масак), якая развівала дэмакр. рэаліст. тэндэнцыі і выкарыстоўвала вопыт гуманіст. драмы. Яна падрыхтавана дзейнасцю акцёра і драматурга А. Беолька (Рудзантэ). У 17—18 ст. т-р І. страціў нац. самабытнасць, камедыя дэль артэ ператварылася ў развесяляльнае відовішча. У 18 ст. пад уплывам ідэй бурж. Асветніцтва драматург К. *Гальдоні* ажыццявіў рэформу нац. т-ра. Гальдоні апіраўся на дэмакр. традыцыі гуманіст. і імправізацыйнай камедыі; адмовіўшыся ад традыц. тыпаў камедыі дэль артэ, замяніў іх рэаліст. вобразамі. Супраць рэформы Гальдоні ў 60—70-я г. 18 ст. выступіў драматург К. *Гоцы*. Выкарыстаўшы традыцыі камедыі дэль артэ, Гоцы стварыў новы тэатр. жанр ф'яба (жанр казкі). Уздым рэвалюц. руху ў канцы 18 ст. выклікаў цікавасць да жанру гераічнай трагедыі (драматург В. Альф'еры, акцёры А. Маракезі, П. Бланес, К. Маркіёні). З нац.-вызв. рухам у пач. 19 ст. фарміруецца драматургія італьян. рамантызму. Рэвалюц.-дэмакр. драматургія садзейнічала развіццю новай рэаліст. школы акцёрскага мастацтва італьян. трагікаў Г. *Модэны* і яго паслядоўнікаў — А. *Рысторы*, Э. *Росі*, Т. *Сальвіні*. Яны сцвярджалі грамадзянскае мастацтва, прасякнутае нац.-вызв. ідэямі. Пасля 1870 у рэпертуары т-раў пераважала меладрама (П. Джакамеці) і бытавая камедыя (П. Ферары і інш.). Рэаліст. рысы асталіся ў драматургіі і т-ры, што выкарыстоўвалі нар. дыялекты (п'есы Дж. Галіны, акцёры Э. Навелі, Дж. Гоцы, Дж. Граса). Сцвярджэнне верызму, які развіваў натураліст. тэндэнцыі, пазбавіла сцэнічнае мастацтва гераічнай накіраванасці (акцёры Э. Цаконі, Э. Навелі). У канцы 19 — пач. 20 ст. пашырыліся дэкадэнцкія плыні (драмы Г. Д'Анунцыо). Трагічныя супярэчнасці сучаснай рэчаіснасці адлюстраваны ў п'есах і т-ры Л. Пірандэла. Спадчынніцай мастацтва вялікіх трагікаў у пач. 20 ст. стала Э. *Дузэ*. У час фаш. дыктатуры т-р і драматургія занепадаюць. Спробы стварыць «гераічны», «неакласічны» т-р праваліліся; дзейнічалі пераважна вандроўныя трупы. Пасля ліквідацыі фашызму і моцнага ўздыму дэмакр. сіл сцвярджаецца прагрэс. кірунак у тэатр. мастацтве: т-р «Сан-Фердынанда» (Неапаль, кіраўнік Э. *Дэ Філіпа*), «Пікала-т-р» (Мілан, рэж. Дж. Стрэлер); трупы Р. Марэлі і П. Стопы, рэжысёры Л. Вісконці, А. Коста, рэж. і драматург Л. Скуарцына, акцёр В. Гасман. У адносінах да т-ра італьян. ўрад прытрымліваецца рэакц., каталіцкай арыентацыі; паліт. цэнзура перашкаджае паяўленню спектакляў на вострыя паліт. тэмы. Па-ранейшаму т-ры вандроўныя, недаўгавечныя, пераважаюць развесяляльныя жанры, нізкі маст. ўзровень спектакляў. З 2-й пал. 40-х г. узнікаюць стацыянарныя т-ры «стабіле» (з 60-х г. субсідзіруюцца дзяржавай і гарадскімі муніцыпалітэтамі). Т-ры «стабіле» далёкія ад камерцыйнага прадпрымальніцтва, маюць асветніцкія дэмакр. мэты, распаўсюджваюць абанементы са скідкай сярод працоўных, студэнтаў, наладжваюць дыспуты. У 1967 працавала 8 драм. т-раў «стабіле», 41 прыватная трупа. У 1964 Генуэзскі гарадскі т-р гастраляваў у Мінску. Сярод лепшых прыватных калектываў — трупа пад кіраўніцтвам рэж. Дж. Лула і акцёраў Р. Фальк, А. Валі, Р. Альбані. Сярод вядомых акцёраў — Дж. Альбертацы, М. Бенасі, А. М. Гуарн'еры, Л. Брыньёне, Г. Праклемер. Значнае месца ў тэатр. жыцці займаюць спектаклі на пляцоўках ант. т-раў у Сіракузах, Остыі. Дэмакр. тэндэнцыі жывуць моцна ў дзейнасці аматарскіх т-раў. Паслядоўную барацьбу за сцвярджэнне рэвалюц., дэмакр. т-ра вядзе ІКП, якая адстойвае ідэйнасць і рэалізм у мастацтве, заклікае т-р актыўна ўдзельнічаць у барацьбе італьян. народа за сац. перабудову грамадства.

Кіно. Першы італьян. дакумент. фільм выпушчаны ў 1894, з 1904 пастаянная кінавытворчасць. У 1912—13 І. займала вядучае месца ў сусв. кінематаграфіі. Папулярныя псеўдагістар. фільмы — «калосы», фільмы па літ. тэмы, камедыі і салонныя меладрамы. Вылучаліся фільмы (1913—14), створаныя пад уплывам верызму, якія праўдзіва паказвалі жыццё працоўных І. («Згубленыя ў цемры», «Асунта Спіна»). 1-я сусв. вайна пазбавіла кіно І. рынкаў, пачалася канкурэнцыя з ням. і амер. кінематаграфіяй. Прыход да ўлады фашыстаў тармазіў развіццё кінамастацтва. Ажыўленне выклікала паяўленне гукавых фільмаў (1930) з удзелам вядомых спевакоў. Пасля 1945 узнік прагрэс. кірунак *неарэалізм*, які зрабіў кіно І. сусв. вядомым: сцэнарыст Ч. Дзавацiні, рэжысёры А. Блазеці, Л. *Вісконці*, П. Джэрмі, Л. Дзампа, М. Камерыні, А. Латуада, К. Лідзані, Р. *Раселіні*, М. Сальдаці, Дж. *Дэ Сантыс*, В. *Дэ Сіка*. У 40—50-я г. створаны гуманіст. і дэмакр. фільмы, у якіх паказана сапраўдная І. з яе галечай, бытавой пасляваен. неўладкаванасцю: «Рым — адкрыты горад», «Выкрадальнікі веласіпедаў», «Умберта Д.», «Зямля дрыжыць», «Рым у 11 гадзін», «Пад небам Сіцыліі», «Аповесць пра бедных закаханых» і інш. Пасля 1947 частка рэжысёраў адмаўляецца ад сац.-крытычнай і маральнай накіраванасці неарэалізму. Т. зв. «ружоваму» неарэалізму ўласцівы адыход у рэліг.-містычную і псеўданар. праблематыку. У сярэдзіне 50-х г. у кіно І., супраць якога выступалі ўрадавая цэнзура, каталіцкая царква, амер. кінаманаполіі, пачаўся рэзкі спад. Агульная актывізацыя нац.-дэмакр. руху ў краіне абумовіла новы ўздым італьян. кіно ў канцы 50-х і ў 60-я г. Вылучыліся рэжысёры Ф. *Феліні* («Дарога», «Ночы Кабірыі», «Салодкае жыццё») і М. *Антаніёні* («Ноч», «Зацьменне», «Чырвоная пустэча»). Створаны шэраг пераважна антываен. і антыфаш. фільмаў: «Генерал Дэла Ровэрэ», «Вялікая вайна», «У Рыме была ноч», «Чачара», «Чатыры дні Неапаля», «Усе дамоў», «Яны ішлі за салдатамі». Найб. значныя фільмы «Рока і яго браты» Л. Вісконці, кінапамфлеты Ф. Розі «Рукі над горадам», «Сальваторэ Джуліяна», фільм «Таварыш» пра першую рабочую стачку ў І. У 60—70-я г. пашыраны жанр сац. сатыры («Шлюб па-італьянску», «Развод па-італьянску», «Спакушаная і кінутая»). Антыфаш. тэма атрымала і антыкаланіяльнае гучанне — «Бітва за Алжыр», «Куэмада». У 1970 створаны значныя творы «Пагібель багоў», «Метэла» і інш. Значнае месца ў кіно І. займаюць камерц. фільмы («вестэрны», камедыі-дэтэктывы). Ствараюцца фільмы сумеснай сав.-італьян. вытв.: «Яны ішлі на Усход», «Чырвоная палатка» і інш.

Літ.: Маркс К. Революционное движение в Италии, Маркс К. и Энгельс Ф. Соч., т. 6; яго ж. Вопрос об объединении Италии.— Что выиграла Италия?, там жа, т. 13; Энгельс Ф. Итальянская война.— По и Рейн.— Как Австрия держит в своих руках Италию, там жа; яго ж. Будущая итальянская революция и социалистическая партия.— Социализм международный и социализм итальянский, там жа, т. 22; Ленін У. І. З'езд італьянскіх сацыялістаў, Тв., т. 18 (Полн. собр. соч., т. 21); яго ж. Канец вайны Італіі з Турцыяй, Тв., т. 18 (там жа, т. 22); яго ж. Што ж далей? — Пад чужым флагам, Тв., т. 21 (там жа, т. 26); яго ж. Імперыялізм і сацыялізм у Італіі, Тв., т. 21 (там жа, т. 27); яго ж. Прамова па італьянскаму пытанню 28 чэрвеня [III Кангрэс Камуністычнага Інтэрнацыянала 22 чэрвеня — 12 ліпеня 1921 г.], Тв., т. 32 (там жа, т. 44); Грамши А. Избр. произв., пер. с итальян., т. 1—3, М., 1957—59; яго ж. О литературе и искусстве, пер. с итальян., М., 1967; Тольятти П. Избр. статьи и речи, пер. с итальян., т. 1—2, М., 1965; Лонго Л. Народ Италии в борьбе, пер. с итальян., М., 1952; История Италии, т. 1—3, М., 1970—71; Зайцев В. К. Богомильское движение и общественная жизнь Северной Италии эпохи Дученто, Мн., 1967; Кобылянский К. В. Великий Октябрь и революционное движение в Италии (1917—1921), М., 1968; Кирова К. Э. Русская революция и Италия. Март — октябрь 1917 г., М., 1968; Россия и Италия. Из истории русско-итальянских культурных и общественных отношений, М., 1968; Петранович И. М. Положение рабочего класса Италии, М., 1970; Канделоро Д. История современной Италии, пер. с итальян., т. 1—4, М., 1958—1966; Галлени М. Советские партизаны в итальянском движении Сопротивления, пер. с итальян., М., 1970; Галкина Т. А. и Сысоева Н. А. Италия, М., 1972; Грацианский А. Н. Природа Средиземноморья, М., 1971; Дживелегов А. К. Итальянская народная комедия, 2 изд., М., 1962; Мокульский С. С. Итальянская литература. Возрождение и просвещение, М., 1966; Реизов Б. Г. Итальянская литература XVIII в., Л., 1966; Потапова З. М. Итальянская литература Рисорджименто в России 60-х гг. XIX в., у кн.: Из истории литературных связей XIX в., М., 1962; яе ж. Неореализм в итальянской литературе, М., 1961; Полуяхтова И. К. История итальянской литературы XIX в., М., 1970; Де Санктис Ф. История итальянской литературы, пер. с итальян., т. 1—2, М., 1963—64; Всеобщая история архитектуры, т. 4—5, Л.— М., 1966—67; Всеобщая история искусств, т. 3, М., 1962; т. 6, кн. 1, М., 1965; Алпатов М. В. Итальянское искусство эпохи Данте и Джотто, М.— Л., 1939; Лазарев В. Н. Происхождение итальянского Возрождения, т. 1—2, М., 1956—59; Бернсон Б. Живописцы итальянского Возрождения, пер. с англ., М., 1965; Виппер Б. Р. Борьба течений в итальянском искусстве XVI века (1520—1590), М., 1956; яго ж. Проблема реализма в итальянской живописи XVII—XVIII веков, М., 1966; Горяинов В. В. Современное искусство Италии, М., 1967; Ливанова Т. История западноевропейской музыки до 1789 года, М.— Л., 1940; Хохловкина А. Западноевропейская опера, М., 1962; Дживелегов А. и Бояджиев Г. История западноевропейского театра. От возникновения до 1789 года, М.— Л., 1941; История западноевропейского театра, т. 1—3, М., 1956—1963; Современное искусство. Италия, М., 1970; Кьярини Л. Сила кино, пер. с итальян., М., 1955; Лидзани К. Итальянское кино, пер. с итальян., М., 1956; Соловьева И. Кино Италии, М., 1961; Зоркая Н. М. Между прошлым и будущим, М., 1961; Садуль Ж. Всеобщая история кино, пер. с франц., т. 3, 6, М., 1961—63; Феррара Дж. Новое итальянское кино, пер. с итальян., М., 1959; Муратов Л. Итальянский экран, Л., 1971.

В. Р. Заўрыеў (прырода), *М. Т. Раманоўскі* (гаспадарка), *А. А. Прымачонак* (дзярж. лад), *Д. Б. Мельцэр* (гістар. нарыс з 1918); *Дз. П. Бяляцкі* (ахова здароўя). Мінск; *Г. А. Касвін* (асвета), *Н. Г. Еліна*, *З. М. Патапава* (літаратура), *Г. І. Апачынская* (архітэктура), *В. А. Лебедзеў* (выяўл. мастацтва), *Г. Дз. Багемскі* (кіно). Масква.

ІТАЛЬЯНСКАЯ КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ (ІКП; да 1943 Камуністычная партыя Італіі), засн. 21.1.1921 на з'ездзе ў Ліворна групамі камуністаў, што парвалі з рэфармісцкай Італьян. сацыяліст. партыяй. Адразу пасля заснавання ІКП далучылася да Камінтэрна. Вялікую ролю ва ўтварэнні ІКП адыграла турынская сацыяліст. група «Новы лад» на чале з А. *Грамшы* і П. *Тальяці*.

А. Грамшы ўзначаліў барацьбу супраць сектанцкай групы А. Бардыгі, якая спачатку стаяла на чале партыі і была канчаткова разбіта на III з'ездзе ІКП (1926). У 1926—43 ІКП дзейнічала ў глыбокім падполлі. Пасля арышту А. Грамшы (1926) партыю ўзначаліў П. Тальяці. ІКП адна з першых сярод камуніст. партый пачала барацьбу супраць фашызму і мужна змагалася да поўнага яго разгрому ў 2-й сусв. вайне. ІКП настойліва змагалася за адзінства рабочага класа і ўсіх дэмакр. сіл, спалучала легальныя і нелегальныя формы

дзейнасці, працавала ў гушчыні мас. Многія камуністы Італіі ўдзельнічалі ў нац.-рэвалюц. вайне ісп. народа супраць фаш. мяцяжу і італа-герм. інтэрвенцыі ў 1936—39. З пачаткам 2-й сусв. вайны ІКП скансалідавала дзейнасць на тым, каб наблізіць крах фаш. дыктатуры ў краіне. Партыя стала гал. арганізатарам масавых забастовак і дэманстрацый у сак. 1943, напярэдадні падзення фаш. рэжыму. Камуністы былі найб. актыўнай і паслядоўнай сілай у Італіі. Руху Супраціўлення ў 1943—45 і ў час усенароднага паўстання ў крас. 1945, якое закончылася поўным вызваленнем Італіі ад ням. акупантаў. Уплыў партыі ў масах моцна вырас. Колькасць яе членаў да канца 1945 склала 1700 тыс.

У 1944—47 ІКП удзельнічала ва ўрадзе Італіі. Ей належала важная роля ў барацьбе, якая забяспечыла ўстанаўленне ў Італіі рэспублікі, прыняцце канстытуцыі з глыбока дэмакратычнымі палажэннямі. Пасля 1947, калі рэакцыя вымусіла камуністаў выйсці з урада, ІКП пераадолела сектанцкія і апартуністычныя настроі ў сваіх радах. VIII з'езд (1956) прыняў новую праграму барацьбы за сацыялізм, дапоўненую IX—XII з'ездамі. ІКП лічыць, што ва ўмовах Італіі існуе магчымасць мірнага пераходу да сацыялізма. ІКП змагаецца за мабілізацыю рабочага класа, усіх працоўных на барацьбу супраць усеўладдзя манаполій, на абарону дэмакр. правоў, за ажыццяўленне «структурных рэформ» — карэнных сацыяльна-паліт. і эканам. пераўтварэнняў у інтарэсах народа, якія падрыхтуюць у рамках канстытуцыйнага ладу неабходныя ўмовы для непасрэднай барацьбы за сацыялізм. Праграму ІКП падтрымліваюць шматмільённыя масы працоўных Італіі. На парламенцкіх выбарах 1968 за ІКП галасавала 26,9% выбаршчыкаў, а ў 1970 на муніцыпальных і абласных — 27,9%. У палаце дэпутатаў ІКП мае 172 месцы з 630 і ў сенаце 77 з 315. ІКП удзельнічала ў міжнар. нарадах камуніст. і рабочых партый у Маскве 1957, 1960, 1969. На Нарадзе 1969 падпісала 3-і раздзел Асноўнага дакумента. Будуецца паводле прынцыпаў дэмакр. цэнтралізму. 1507 тысяч чл. (1971). Старшыня ІКП Л. Лонга, ген. сакратар Э. Берлінгуэр. Друк. органы — газ. «L'Unità» («Адзінства») і час. «La Rinàscita» («Адраджэнне»).

Літ.: Тольятти П. Жизнь и борьба Итальянской коммунистической партии, М., 1963; Лопухов Б. Р. Образование Итальянской коммунистической партии, М., 1962; Боевой авангард трудящихся Италии. 50 лет Итальянской коммунистической партии, М., 1971. *А. І. Самаль.* Мінск.

ІТАЛЬЯНСКАЯ МОВА, адна з раманскай групы *індаеўрапейскіх моў*. Дзярж. мова Італьянскай Рэспублікі, адна з дзярж. моў Самалі. Пашырана таксама ў Сан-Марына, Швейцарыі, на а-вах Корсіка і Мальта, у Венецыі-Джуліі, Істрыі, Эфіопіі, Лівіі, сярод італьян. эмігрантаў (каля 7 млн. чал.), большасць якіх жыве ў ЗША. На І. м. ў Італіі гавораць каля 53,5 млн. чал.

І. м. развілася з пар. латыні пасля падзення Рымскай імперыі. Першыя пісьмовыя помнікі на розных італьян. дыялектах з 10—12 ст.; першыя літ. помнікі з 13 ст. Італьян. дыялекты падзяляюцца на 3 групы: паўночную (гала-італьян. дыялекты П'емонта, Ламбардыі, Эміліі-Раманьі, вобласці Венета, дыялект Істрыі); цэнтральна-паўднёвую (дыялекты Марке, Умбрыі, Рымскай вобл., Кампаніі, Апуліі, Абруцці-э-Маліэз, Луканіі, Сіцыліі) і тасканскую (дыялекты Фларэнцыі, Сіены, Арэцца, Пізы). Некат. паўн. і паўд. дыялекты (венецыянскі, міланскі, неапалітанскі, сіцылійскі і інш.) маюць літ. варыянт. Агульнаітальян. літ. мова склалася на аснове фларэнтыйскага дыялекту (14 ст.) і замацавалася дзякуючы творчасці пісьменнікаў Дантэ, Петраркі і Бакачыо. Да 1870 Італія не мела адзінага культ. цэнтра, таму агульнаітальян. мова за межамі Тасканы аж да 20 ст. (і толькі ў пісьмовай форме) была даступнай адукаванай частцы насельніцтва. Цяпер вусная літ. норма пад уплывам радыё і тэлебачання адцясняе дыялекты, набываючы ў розных абласцях дыялектную афарбоўку. Асн. асаблівасці І. м.: у фанетыцы — усе словы канчаюцца на галосны гук, пад націскам адрозніваецца 7 галосных, шэраг дыфтонгаў, частыя спалучэнні па некалькі галосных, вымаўленне гукаў выразнае і напружанае; у марфалогіі — грамат. значэнне асобы, ліку, часу, ладу выражана флексіяй дзеяслова, сістэма часоў індыкатыву складаецца з 4 простых і 4 складаных формаў; у сінтаксісе — свабодны парадак слоў.

Літ.: Гурычева М. С. Сравнительно-сопоставительная грамматика романских языков. Итало-романская подгруппа, М., 1966; Бурсье Э. Основы романского языкознания, пер. с франц., М., 1952; Migliorini B. Storia della lingua italiana, 3 ed., Firenze, 1961. *Т. В. Алісава.* Масква.

ІТАН (Eaton) Сайрус (н. 27.12.1883, в. Пагуаш, Канада), буйны прамысловец, грамадскі дзеяч ЗША. Скончыў Макмастэрскі ун-т у Таронта (1905). З 1913 у падданстве ЗША. Адзін з відных і ўплывовых кіраўнікоў кліўлендскай фінанс.-прамысл. групы. Апякун многіх навуч. устаноў і культ.-асвет. арг-цый ЗША. З сярэдзіны 50-х г. выступае супраць гонкі ўзбраення, за мірнае суіснаванне, за гандаль з СССР. Па яго ініцыятыве праводзяцца Пагуашскія канферэнцыі вучоных розных краін за захаванне міру (гл. *Пагуашскі рух*). Няраз быў у СССР. Міжнар. Ленінская прэмія «За ўмацаванне міру паміж народамі» за 1959.

Літ.: Зорин В. С. Некоронованные короли Америки, 3 изд., М., 1970, с. 236—248.

ІТКІНА Марыя Лявонаўна (н. 3.5.1932, Смаленск), беларуская савецкая спартсменка, засл. майстар спорту СССР (1960) па лёгкай атлетыцы. Скончыла Бел. ін-т фіз. культуры (1957). Чэмпіёнка Еўропы ў бегу на 200 *м* і ў эстафеце 4×100 *м* (Берн, Швейцарыя, 1954), у бегу на 400 *м* (Стакгольм, 1958; Бялград, 1962). Пераможца Кубка Еўропы ў бегу на 400 *м* (Касель, ФРГ, 1965), матчаў СССР — ЗША (1957), СССР — ФРГ (1958), СССР — Англія (1962, 1964). 11-разовая рэкардсменка свету, 18-разовая чэмпіёнка СССР. З 1967 трэнер Бел. савета «Дынама». Узнаг. ордэнам «Знак Пашаны», медалямі.

ІТРЫЙ (Yttrium), Y, хім. элемент III групы перыяд. сістэмы Мендэлеева, ат. н. 39, ат. м. 88,905. Металічны І. упершыню атрыманы ў 1828. У зямной кары знаходзіцца $2{,}8 \cdot 10^{-3}$% па масе, трапляецца разам з інш. *рэдказямельнымі элементамі*.

Прыродны І. — стабільны ізатоп ^{89}Y. Шэра-чорны лёгкі, мяккі метал, t пл. 1525 °С, t кіп. 3025 °С, шчыльн. 4472 *кг/м*^{3}. Хім. ўласцівасцямі нагадвае *лантан* і *лантаноіды*. Растварэцца ў к-тах. Узаемадзейнічае з галагенамі, пры нагрэванні — з вадародам, кіслародам, азотам і інш. Ужываецца для легіравання некат. сплаваў, у радыёэлектроніцы, медыцыне.

Літ.: Редкоземельные элементы, М., 1963; Терехова В. Ф. и Савицкий Е. М. Иттрий, М., 1967 (бібліягр.); Некрасов Б. В. Основы общей химии, т. 2, 2 изд., М., 1969, т. 3, М., 1970.

ІТЫЛЬ, 1) назва р. Волгі ў арабскіх крыніцах 8—10 ст. 2) Горад ў 8—10 ст. Сталіца Хазарскага каганата (каля сучаснай Астрахані). Быў цэнтрам караваннага гандлю, гандлю рабамі. Разбураны ў 965 кіеўскім кн. Святаславам.

ІТЭРАЦЫЯ ў матэматыцы (ад лац. iteratio паўтарэнне), вынік паўторнага выкарыстання пэўнай матэм. аперацыі.

Калі $y=f(x)=f_1(x)$, то функцыі $f_2(x)=f[f_1(x)]$, $f_3(x)=f[f_2(x)]$, ..., $f_n(x)=f[f_{n-1}(x)]$ — паслядоўнасць І. функцыі $f(x)$. Напр., калі $f(x)=ax$, то гэта паслядоўнасць запісваецца ў выглядзе ax, a^2x, a^3x, ..., a^nx; n — паказчык І. Працэс вылічэння членаў паслядоўнасці — ітэраванне — выкарыстоўваецца ў многіх раздзелах матэматыкі, у т. л. пры рашэнні розных ураўненняў і сістэм ураўненняў *паслядоўных прыбліжэнняў метадам*.

Літ.: Герсеванов Н. М. Итерационное исчисление и его приложения, М., 1950.

ІУДАІЗМ, рэлігія, пашыраная пераважна сярод яўрэяў. Асн. догматы: вера ў адзінага бога Яхве, «богавыбранасць» яўрэяў, прышэсце месіі, набліжэнне канца свету і ўваскрэсенне мёртвых і інш. У І. мноства абрадаў, малітваў, пастоў, святаў, якія выкладзены ў Торы, Талмудзе і рабінскай л-ры.

І. склаўся з вераванняў і абрадаў яўр. плямёнаў, якія вандравалі ў 2-м тысячагоддзі да н. э. па Аравійскай пустыні, потым стаў рэлігіяй двюх рабаўладальніцкіх дзяржаў — Ст. Ізраіля і Іудзеі. У розны час мяняў свой змест і форму адпаведна змене грамадскіх адносін. Стараж. этап рэлігіі яўрэяў адлюстраваны ў Бібліі (біблейскі І.), у першыя стагоддзі н. э. І. набыў форму, якая ў асноўным асталася да нашага часу. У 1-й пал. 19 ст. сярод яўр. буржуазіі шэрагу краін Зах. Еўропы і ЗША расло імкненне да рэформы І. і прыстасавання яго да ўмоў капіталіст. грамадства. Рэфармісты адмовіліся ад абрадаў і законаў, якія аджылі, значна скарацілі колькасць рэліг. святаў, адмаўляліся аўтарытэт Талмуду. У рэфармаваных сінагогах набажэнства вялося на мове той краіны, на тэрыторыі якой яны знаходзіліся. У царскай Расіі іудзейскае духавенства трымала ў невуцтве яўрэйскае насельніцтва, перашкаджала праніканню ў яго асяроддзе прагрэс. ідэй. Іудзейскія клерыкалы варожа сустрэлі Кастр. рэвалюцыю, у гады грамадз. вайны, калектывізацыі і індустрыялізацыі многія з іх вялі антысавецкую дзейнасць. Пад уплывам працоўных яўрэяў іудзейскае духавенства паступова стала лаяльна ставіцца да сав. грамадскага ладу. Пасля 2-й сусв. вайны цэнтр І. перамясціўся з Еўропы ў ЗША. І. служыць буржуазіі сродкам духоўнага прыгнёту нар. мас, адцягнення іх ад камуніст. руху. У Ізраілі І. — дзярж. рэлігія. Самыя рэакц. догмы і палажэнні І. — аснова сіянісцкай ідэалогіі (гл. *Сіянізм*).

Літ.: Рановіч А. Очерк истории древнееврейской религии, М., 1937; Крывелев И. А. Книга о Библии, 2 изд., М., 1959; Шахнович М. И. Реакционная сущность иудаизма, М.—Л., 1960; Лившиц Г. М. Происхождение и реакционная сущность иудаизма, Мн., 1962; Беленький М. С. Иудаизм, М., 1966; Яго ж. Что такое Талмуд, 2 изд., М., 1970. *Г. М. Ліўшыц.* Мінск.

ІУДЗЕЙСКАЕ ЦАРСТВА, раннерабаўладальніцкая дзяржава ў Паўд. Палесціне, узнікла каля 935 да н. э. ў выніку распаду Ізраільска-Іудзейскага царства.

Занятак насельніцтва — земляробства, жывёлагадоўля, рамяство, гандаль. Рост ліхвярства, узмацненне буйнога землеўладання, расслаенне абшчыны вяло да разарэння нар. мас. Вострая класавая барацьба знайшла адбітак у пропаведзях прарокаў (гл. *Прарокі біблейскія*). Культ бога Яхве (Ягве) у 7 ст. да н. э. цэнтралізаваны. І. ц. вяло войны з Ізраільскім царствам, філістымлянамі, Егіптам, Дамаскам, Асірыяй. У 586 да н. э. завалявана вавілонскім царом Навухаданосарам II, значная частка іудзеяў была выведзена ў Вавілонію (т. зв. Вавілонскі палон). У 538 да н. э. перс. цар Кір II вярнуў палонных у Палесціну, дазволіў адбудаваць Іерусалім. Улада перайшла ў рукі каленіі жрацоў пад наглядам персідскага сатрапа. У 332 да н. э. І. ц. падпарадкавала *Аляксандрам Македонскім*, у 3—2 ст. да н. э. пад уладай егіпецкай дынастыі *Пталамеяў* і сірыйскай дынастыі Селеўкідаў. У 167 да н. э. ў выніку паўстання стала незалежным пад уладай дынастыі Хасманеяў. У 63 да н. э. трапіла ў залежнасць ад Рыма. З 6 н. э. рымскай правінцыі. Пасля т. зв. Іудзейскай вайны 66—73 І. ц. канчаткова падпарадкавана Рымам.

Літ.: Амусин И. Д. Рукописи Мертвого моря, М., 1961; Крывелев И. А. Книга о Библии, 2 изд., М., 1959; Ранович А. Очерк истории древнееврейской религии, М., 1937.

Р. А. Нікольская. Мінск.

ІУЕ, гар. пасёлак (з 1940), цэнтр Іуеўскага р-на Гродзенскай вобл., на р. Іўянка. За 158 *км* на У ад Гродна, 10 *км* ад чыг. ст. Гаўя. 5,0 тыс. ж. (1971). Прадпрыемствы: агародніна-кансервавы з-д, маслазавод, хлебакамбінат, камбінат быт. абслугоўвання, лясгас. Сярэдняя школа, школа рабочай моладзі, школа-інтэрнат, муз. і спарт. школы, дзіцячы сад і яслі, Дом піянераў, Дом культуры, кінатэатр, клуб, 2 б-кі, бальніца. За 1 *км* ад І. парк 18—19 ст. 2 помнікі: на брацкай магіле 52 сав. воінаў і партызанаў; на брацкай магіле 40 сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны. За 2,5 *км* ад І. помнік 2500 мірным жыхарам, якіх ням.-фаш. захопнікі расстралялі 12.5.1942.



Іўе. Вуліца 50 гадоў Кастрычніка.

Вядомы з 17 ст. У 17 ст. тут працавала адна з першых на Беларусі друкарняў, у якой надрукавана «Граматыка» Мялеція Сматрыцкага. У 19 — пач. 20 ст. мястэчка Ашмянскага пав. Віленскай губ. У 1921—39 у бурж. Польшчы ў Валожынскім пав. Навагрудскага ваяводства. У 1925 у І. баставалі кавалі і гарбары. З чэрв. 1941 да 7.7.1944 акупавана ням.-фаш. захопнікамі.

ІУЕЎСКІ РАЁН, у складзе Гродзенскай вобл. Утвораны 15.1.1940. Размешчаны на ПнУ вобл. Пл. 1,9 тыс. *км*^{2}. Нас. 57,0 тыс. чал. (1971). Падзяляецца на 11 сельсаветаў; 2 гар. пасёлкі: Іўе — цэнтр раёна, Юрацішкі.

Паўн. ч. раёна ў межах хвалістай, месцамі плато падобнай марэннай Лідскай раўніны. Паўд. ч. — плоская водналедавіковая Верхнянёманская нізіна. Карысн. выкапні: 2 радовішчы торфу з агульн. запасамі 7,3 млн. *т*, у т. л. радовішча Краснае (паблізу г. п. Іўе) — 3,9 млн. *т*; 3 радовішчы цагельнай сыравіны — 1,4 млн. *м*^{3}, у т. л. радовішча Морына — 1,1 млн. *м*^{3}; 2 радовішчы пясчана-жвіровага матэрыялу — 1,9 млн. *м*^{3}, у т. л. радовішча Харытоны — 1,7 млн. *м*^{3}. Сярэдняя т-ра студз. ад −6 да −6,5 °С, ліп. ад 17,5 да 18 °С. Ападкаў 640 *мм* за год. Вегет. перыяд 193 дні. Рэкі Нёман па крайнім Пд раёна, яго правыя



прытокі: Гаўя з Жыжмай, Клявой і Апітай; Бярэзіна з Іслаччу, Галышанкай і Чапунькай. Па Бярэзіне і Нёмане сплаў лесу. Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (48,9%), дзярнова-падзоліста-забалачальныя (21,5%), дзярнова-балотныя (13,4%), тарфяна-балотныя (10,7%), алювіяльныя (5,5%). З мінер. глебаў 79,1% супясчаных, 20,3 пясчаных, 0,6% суглінкавых. Якасная ацэнка глебаў у балах: ворных зямель — 31 (цана бала 0,33 *ц/га* збожжа), кармавых угоддзяў — 26, усіх с.-г. угоддзяў — 30. Пад лесам 40% тэр. раёна. Пераважае хвоя, растуць елка, бяроза, вольха, асіна, дуб. Асн. насельніцтва беларусы, ёсць палякі, рускія, татары, літоўцы. Сярэдняя шчыльн. 30 чал. на 1 км². Гар. нас. 12,5%.

Прадпрыемствы: агароднінакансервавы з-д, маслазавод, хлебакамбінат, камбінат быт. абслугоўвання, лясгас (Іўе), торфапрадпр. «Краснае» (Лукашына), агароднінасушыльны з-д, участак Астравецкага прамкамбіната, малаказавод, лясніцтва (Юрацішкі), цагельня (Морына), лесаўчастак Маладзечанскага леспрамгаса (Бакшты), раённае аб'яднанне і спецыялізаванае адз. Сельгастэхнікі (Ліпішкі). У раёне 23 калгасы і 4 саўгасы (1971).

Бальніца ў вёсцы Ліпішкі.



Калгасы і іх цэнтры: «Авангард» (*Ліпішкі*), імя XXII з'езду КПСС (*Геранёны*), імя Дзяржынскага (*Кладзінкі*), «Зара» (Барава), імя Заслонава (*Косці*), «Іскра» (*Дайнары*), «Кастрычнік» (*Некрашы*), імя Якуба Коласа (*Красоўшчына*), імя Янкі Купалы (*Лаздуны*), імя Леніна (*Сураж*), «Ленінскі шлях» (*Лежнікі*), «Маладая гвардыя» (*Вялікія Князікоўцы*), «Нёман» (*Морына*), «Новае жыццё» (*Дайлідзы*), «Перамога» (*Лаздуны*), «Радзіма» (*Цэнтральная*), «Світанне» (*Залессе*), «Сцяг камунізма» (*Такарышкі*), «Сямігодка» (*Браслі*), «17 верасня» (*Лежневічы*), імя Ульянава (*Бакшты*), «Ураджай» (*Старчаняты*), «Шлях Леніна» (*Іўе*). Саўгасы і іх цэнтры: «Жамыслаўль» (*Жамыслаўль*), «Суботнікі» (*Суботнікі*), «Трабы» (*Трабы*), «Чарнелі» (*Цянюкабшчына*).

Сельская гаспадарка спецыялізуецца на малочна-мясной жывёлагадоўлі, свінагадоўлі, ільнаводстве; вырошчваюць збожжа і бульбу. Пад сельскагаспадарчымі ўгоддзямі 40% тэрыторыі. На канец 1970 асушана 13,8 тыс. *га* забалочаных зямель. Агульная пасяўная пл. (тыс. *га*, 1970) 48,9, у т. л. пад збожжавымі і зернебабовымі 18,2, тэхн. 3,5, бульбай 7,8, кармавымі 19,1. На пач. 1971 было (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 52,8 (у т. л. кароў 24,4), свіней 42,5, авечак і коз 3,6. Па тэр. раёна з З на У праходзіць чыгунка Гродна — Мінск. Найважн. аўтамаб. дарогі: Ліда — Іўе — Юрацішкі — Валожын, Навагрудак — Іўе — Ашмяны. На пач. 1971 у раёне было 16 сярэдніх, 27 васьмігадовых, 66 пач. школ, 4 школы рабочай моладзі, школа-інтэрнат, муз. і спарт. школы, мед. вучылішча, 11 дашкольных устаноў, 46 клубных устаноў, 36 масавых б-к, 29 кінаўстановак (у т. л. 14 стацыянарных), 8 бальніц, 5 сельскіх амбулаторый, 28 фельч.-ак. пунктаў, дыспансер, лёгачнатуберкулёзны санаторый «Суботнікі». На пач. 1971 у раёне працавала 436 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, у т. л. 12 інжынераў, 31 аграном, 23 заатэхнікі, 6 вет. урачоў, 313 настаўнікаў, 51 урач; 1063 чал. з сярэдняй спец. і незакончанай вышэйшай адукацыяй. Раённая газ. «Путь Ильича».

П. В. Качкоў. Іўе; *Ю. П. Качкоў.* Мінск.



Дамы калгаснікаў калгаса імя XXII з'езду КПСС. Вёска Жылі.

ІЎЛЕЎ Гаўрыла Міхайлавіч (1908, в. Красны Яр Барнаульскага пав. Томскай губ.— 1956), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). У Чырв. Арміі з 1941. Вызначыўся на тэр. Гомельскай вобл. У ноч на 17.10.1943 сапёр І. у некалькіх метрах ад занятага ворагам берага наладзіў паром праз Дняпро, што садзейнічала хуткай пераправе артылерыі на плацдарм.

ІЎЛЕЎ Дзмітрый Данілавіч [н. 29.10(11.11). 1914, с. Прылены Старыаскольскага пав. Курскай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1943. У Чырв. Арміі з 1941. Вызначыўся ў вер. 1943 на тэр. Камарынскага р-на Палескай вобл. Пад варожым агнём з групай байцоў пераправіўся цераз Дняпро, захапіў плацдарм і адбіў 17 контратак. Жыве ў Пяцігорску.

ІЎЛЕЎ Рыгор Георгіевіч [6(19).8.1909, в. Вішанкі Руаскага пав. Маскоўскай губ.— 19.6. 1944], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Баранавіцкай вобл. ў Айч. вайну. З сілян. Чл. КПСС з 1940. Скончыў Маскоўскі палітэхнікум (1934). З 1941 на фронце, камандзір батальёна. У партызанах з вер. 1942 — палітрук роты, камісар атрада; з снеж. 1943 камісар *партызанскай брыгады «Перамога»* Баранавіцкай вобл. Узнаг. ордэнам Айч. Вайны 1-й ступені, медалём. Загінуў у баі.

ІЎЛІЕЎ Юрый Дзмітрыевіч (17.4.1923, Ташкент — 11.2.1945), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Канд. у чл. КПСС. У Чырв. Арміі з 1940. Камандзір авіяэскадрыллі на Зах. і 2-м Бел. франтах. Зрабіў больш за 120 баявых вылетаў. Вызначыўся пры вызваленні Магілёва, Мінска, Гродна. Пахаваны ў Гродне.

ІЎРЫТ (старажытнаяўрэйская мова), дзяржаўная мова Ізраіля. У гісторыі развіцця (болей за 3 тыс. гадоў) вылучаецца тры перыяды: класічны, або біблейскі І., мова свяшчэнных кніг сярэдневечча (Мішна, Талмуд, Мідрашы) і сучасная пісьмовая і размоўная мова. Аснова пісьменнасці на І.— канаанітны алфавіт самай стараж. формы (гл. *Яўрэйскае пісьмо*).

І. мае агульныя рысы з інш. мовамі семіта-хамітскай сям'і, у якую ён уваходзіць: 2 грамат. роды (мужчынскі і жаночы); лічэбнікі 3—10 ужываюцца ў родзе, процілеглым роду назоўніка?; форма роду выражаецца постфіксамі і прэфіксамі займеннікавага паходжання, якія далучаюцца да кораня слова; як граматычны сродак шырока выкарыстоўваецца змяненне галосных асновы і інш. У І. шмат агульнай лексікі з арамейскай, акадскай, эфіопскай і інш. семіта-хамітскімі мовамі.

ІХТЫЁЗ (грэч. ichthýs рыба), рыбіна луска, ксерадэрма, хвароба скуры з парушэннем працэсаў арагавення, адлушчвання, пота- і тлушчавыдзялення. У большасці выпадкаў спадчынная хвароба, выяўляецца з дзяцінства. Прыкметы: скура тоўстая, сухая, з трэшчынамі і вялікай колькасцю лусак. Лячэнне сімптаматычнае: лушчыльныя мазі, вітамін А. рыбін тлушч. ванны.

Літ.: Павлов С. Т. Кожные и венерические болезни, 2 изд., Л., 1969.

ІХТЫЯЗАЎРЫ (грэч. ichthýs рыба+saurus яшчарка), рыбаяшчары, атрад вымерлых марскіх паўзуноў. Жылі ў мезазойскую эру. Даўж. 13 м. Мелі верацёнападобнае, сплюшчанае з бакоў цела, мякі спінны і цвёрды хваставы плаўнікі. Парныя канечнасці ператвораны ў ласты (задняя значна карацейшыя за пярэднія). Чэрап з доўгім рылам, вялікімі круглымі ці авальнымі вочніцамі. Шмат вострых зубоў, якія сядзелі ў ячэйках-альвеолах. Жывародныя. Кармяліся рыбамі і



галаваногімі малюскамі. Рэшткі І. знойдзены ў Еўропе, Азіі і Паўн. Амерыцы, у СССР — у Паволжы, Падмаскоўі, на р. Пячора і Калыма.

Літ.: Основы палеонтологии. Справочник для палеонтологов и геологов СССР. Земноводные, пресмыкающиеся и птицы, М., 1964.

В. В. Шчаглова. Мінск.

ІХТЫЯЛОГІЯ (грэч. ichthýs рыба+...логія), раздзел *заалогіі*, які вывучае *рыб* (будову, спосаб жыцця, узаемадзеянне з навакольным асяроддзем, індывідуальнае і эвалюцыйнае развіццё, сістэматыку, геагр. пашырэнне і гасп. выкарыстанне).

Першыя сістэматызаваныя звесткі пра будову і біялогію рыб трапляюцца ў працах Арыстоцеля (4 ст. да н. э.). У 15—19 ст. сабраны вялікі фактычны матэрыял па фаўне рыб (працы франц. вучоных П. Белона, Г. Рандэле, швед. вучоных П. Артэдзі, К. Лінея, рус. вучоных С. П. Крашанінікава, П. С. Паласа, І. І. Лэпёхіна і інш.), у выніку чаго І. вылучылася ў самастойную навуку. У канцы 19 — пач. 20 ст. даследуюцца дынаміка колькасці прамысл. рыб, уплыў промыслу на запасы рыбы, заканамернасці ўзнаўлення рыбных запасаў і інш. Развіццю І. ў Расіі і СССР садзейнічалі даследаванні К. М. Бэра, М. Я. Данілеўскага, К. Ф. Кесслера, А. А. Грыма, І. М. Арнольда, М. Л. Чугунова, У. К. Салдатава, П. Ю. Шміта, В. І. Мейснера, К. А. Кісялевіча, М. М. Кіповіча, Б. І. Чэрфаса, Ф. І. Баранава і інш. Вялікі ўклад у развіццё І. зрабіў Л. С. Берг (сістэматыка, пашырэнне, экалогія, палеанталогія рыб). Сав. іхтыёлагі распрацавалі спец. метады даследавання ўзросту і росту, жыўлення, размнажэння, міграцыі і інш. пытанні біялогіі рыб. Вывучаюцца рэакцыі рыб на гукавыя хвалі рознай частаты, на святло, на ўздзеянне электр. і магн. палёў; распрацоўваюцца метады матэм. мадэлявання экасістэм. Асн. праблемы: дынаміка колькасці рыбнага статка, паводзіны, размеркаванне і міграцыі рыб, узнаўленне рыбных запасаў, прадукцыйнасць рыбных вадаёмаў. Даследаванне іх неабходна для развіцця актыўнага марскога рыбаводства і рыбаводства ва ўнутр. вадаёмах. Іхтыялагічныя даследаванні ў СССР выконвае сістэма спецыялізаваных н.-д. устаноў па вывучэнні рыбнай гасп. мораў і акіянаў (узначальвае Усесаюзны НДІ марской рыбнай гасп. і акіянаграфіі), Дзяржк. НДІ азёрнай і рачной рыбнай гасп., Усесаюзны НДІ сажалкавай рыбнай гасп., адпаведныя ін-ты АН СССР і саюзных рэспублік, інш. ўстановы. Каардынацыю даследаванняў ажыццяўляе Іхтыялагічная камісія Мін-ва рыбнай гасп. СССР і праблемны навуковы савет пры АН СССР. Вынікі даследаванняў друкуюцца ў час. «Вопросы ихтиологии», «Рыбное хозяйство», «Зоологический журнал» і інш.

Іхтыялагічныя даследаванні на Беларусі пачаліся ў 1924, калі Наркамзем рэспублікі наладзіў Бел. рыбагаспадарчую экспедыцыю. У 1928 арганізавана н.-д. станцыя рыбнай гасп. (правяла вял. работу на даследаванні азёраў і сажалкавых гасп. ва ўсх. абласцях Беларусі), пераўтвораная ў 1959 у Бел. НДІ рыбнай гасп. Работы па І. вядуцца таксама ў БДУ і АН БССР. Асн. вынікі работ апублікаваны ў «Працах Беларускага навукова-даследчага ін-та рыбнай гаспадаркі» (т. 1, 1957; т. 2,

1958; т. 3, 1960), у зб. «Пытанні рыбнай гаспадаркі Беларусі» ([т. 4], 1962; т. 5, 1964; т. 6, 1969; т. 7, 1970), «Вучоных запісках БДУ» (в. 17, 1954; в. 33, 1957) і ў інш. выданнях.

Літ.: Берг Л. С. Система рыбообразных и рыб, ныне живущих и ископаемых, 2 изд., М.— Л., 1955 (Труды Зоологического ин-та, т. 20); ягож. Рыбы пресных вод СССР и сопредельных стран, ч. 1—3, 4 изд., М.— Л., 1948—49; Промысловые рыбы СССР, М., 1949; Суворов Е. К. Основы ихтиологии, 2 изд., М., 1948; Никольский Г. В. Частная ихтиология, 3 изд., М., 1971; ягож. Экология рыб, М., 1961; ягож. Теория динамики стада рыб..., М., 1965; Пучков Н. В. Физиология рыб, М., 1954; Жуков П. И. Рыбы Белоруссии, Мн., 1965 (бібліягр.); ягож. Биологические основы рыболовства, Мн., 1968; Правдин И. Ф. Руководство по изучению рыб, 4 изд., М., 1966; Развитие биологии в СССР, М., 1967; Навука БССР за 50 год, Мн., 1968. *П. І. Жукаў.* Мінск.

ІХТЫЯФАЎНА (грэч. ichthýs рыба + *фаўна*), сукупнасць відаў рыб пэўнага геагр. раёна, басейна, вадаёма ці яго зоны (напр., Ціхага акіяна, рэк бас. Балтыйскага м., воз. Нарач, сярэдняга цячэння Дняпра), пэўнага адрэзку часу ў гісторыі зямлі (напр., мелавога перыяду). І. вывучае *іхтыялогія*.

І. большасці басейнаў складаецца з розных па геагр. паходжанні відаў рыб, якія групуюцца ў асобныя фаўністычныя комплексы. Найбагацейшая І. трапічных, самая бедная — арктычных і антарктычных водаў. Вядома каля 25 тыс. відаў рыб. У СССР 1400 відаў (ва ўнутраных вадаёмах 500), на Беларусі 48 (18 у рэках, 6 у азёрах, астатнія — у рэках, азёрах і вадасховішчах).

Літ.: Гл. пры арт. *Рыбы*.

ІХЭТУАНЬСКАЕ ПАЎСТАННЕ, антыімперыялістычнае паўстанне сялян і гарадской беднаты Паўн. Кітая ў 1899—1901. Было пачата тайным т-вам «Іхэцюань» («Кулак у імя справядлівасці і згоды»). Пазней т-ва і войска паўстанцаў наз. «Іхэтуань» («Атрады справядлівасці і згоды»). Паколькі ў назву т-ва «Іхэцюань» уваходзіла слова «цюань» (кулак), іншаземцы назвалі паўстанцаў «баксёрамі»; адсюль назва «баксёрскае паўстанне».

Паўстанне было выклікана агрэсіяй імперыял. дзяржаў, якія пасля япона-кітайскай вайны 1894—95 падзялілі Кітай на «сферы ўплыву», што прывяло да ўзмацнення эксплуатацыі, абяднення сялян і рамеснікаў, росту падаткаў. Ахапіла паўн. і паўн.-ўсх. правінцыі Кітая. У чэрв. 1900 паўстанцы ўварваліся ў Пекін і прымусілі кіт. ўрад абвясціць вайну імперыял. дзяржавам. Англія, Германія, Аўстра-Венгрыя, Францыя, Японія, ЗША, царская Расія, Італія арганізавалі інтэрвенцыю ў Кітай. Маньчжурскі ўрад здрадзіў паўстанцам, тайна наладзіў сувязі з імперыялістамі. Паўстанне жорстка задушылі. Імперыял. дзяржавы навязалі Кітаю кабальны «Заключны пратакол» (7.9.1901), паводле якога Кітай павінен быў выплаціць вялікую кантрыбуцыю (450 млн. лянаў — каля 650 млн. залатых руб.), прыняць шэраг уніжальных патрабаванняў. І. п. было найвышэйшым этапам стыхійнай барацьбы кіт. сялянства і гарадской беднаты супраць імперыял. прыгнёту ў Кітаі; яно прадэманстравала пачуццё нац. самасвядомасці і рашучасць народа змагацца супраць імперыял. палітыкі падзелу Кітая.

Кр.: Восстание ихэтуаней. Документы и материалы, М., 1968.

ІЦЭНКІ-КУШЫНГА ХВАРОБА, адна з хвароб пярэдняй долі гіпофіза, гл. ў арт. *Гіпофіза хваробы*.

ІШАНТУРАЕВА Сара Абдурахманаўна [н. 26.10(8.11).1911, кішлак Беш-Булак Сырдар'інскай вобл. Туркестана], узбекская савецкая актрыса. Нар. арт. СССР (1951). Чл. КПСС з 1939. З 1927 у т-ры імя Хамзы (Ташкент). Лепшыя ролі: Анахон («Гонар і каханне» К. Яшэна), Джаміля («Бай і батрак» Хамзы), Афелія («Гамлет» У. Шэкспіра), Гулі («Алішэр Наваі» А. Уйгуна і І. Султанава, Дзяржпрэмія СССР 1949), Айні («Алжыр, радзіма мая!» паводле М. Дыба). Дэп. Вярх. Савета СССР 2—4-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга.

Літ.: Авдеева Л. Сара Ишантураева, Ташкент, 1960.

ІШКАЛДСКІ КАСЦЁЛ (Святой Тройцы касцёл у Ішкалдзі), помнік архітэктуры 15 ст. Пабудаваны ў стылі готыкі ў 1472 у в. Ішкалдзь (Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл.). 3-нефавая прамавугольная ў плане [(*м*) 10×14,5] зальная пабудова з вузкімі (да 1,35 *м*) бакавымі нефамі і выцягнутай гранёнай пяцісценнай апсідай. Масіўныя сцены храма ў ніжняй частцы арнаментаваны сеткаватай муроўкай (пазней атынкаваны).





Ішкалдскі касцёл. Уверсе: фасад, падоўжны разрэз. Унізе: апсіда і план.

І. к. мае тыповыя для готыкі нервюрныя, зорчатыя і крыжовыя скляпенні, магутныя контрфорсы, высокі двухсхільны дах, стральчатыя аконныя і дзвярныя праёмы, шчытавая сцяна дэкаравана плоскімі выцягнутымі нішамі. Фігурнае завяршэнне гал. фасада і крывалінейныя абрысы контрфорсаў надаюць касцёлу пластычнасць, змякчаюць манумент. аблічча храма. Іл. гл. таксама ў арт. *Архітэктура*.

У. А. *Чантурыя*. Мінск.

ІШЛІНСКІ Аляксандр Юльевіч [н. 24.7(6.8).1913, Масква], савецкі вучоны ў галіне механікі. Акад. АН СССР (1960) і АН УССР (1948). Герой Сац. Працы (1960). Чл. КПСС з 1940. Скончыў Маск. ун-т (1935), з 1945 праф. гэтага ун-та. Дырэктар Ін-та матэматыкі (1948—55), з 1964 дырэктар Ін-та праблем механікі АН УССР. Навук. працы ў галіне тэорыі пругкасці, пластычнасці, тэорыі ваганняў і гіраскопаў. Даследаваў заканамернасць трэння качэння па дэфармаванай аснове (1937); распрацаваў арыгінальную тэорыю дынамічнай устойлівасці (1949); развіў агульную тэорыю пластычнасці з лінейным умацаваннем (1954); прапанаваў новую схему дэфармавання грунтоў пры выбуху (1954); даследаваў пытанні амартызацыі прылад пры рэзкім тармажэнні (1957); распрацаваў тэорыю прастаравага гіракомпаса і інш. гіраскапічных прылад (1952—63); вёў даследаванні па агульнай тэорыі інерцыяльнай навігацыі і аўтаномнага кіравання (1957—68). Ленінская прэмія 1961. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, 2 ордэнамі Прац. Чырв. Сцяга.



Тв.: К теории гирогоризонткомпаса, «Прикладная математика и механика», 1956, т. 20, в. 4; Механика гироскопических систем, М., 1963; Инерциальное управление баллистическими ракетами, М., 1968.

ІШЧАНКА Іван Мітрафанавіч (н. ў сак. 1912, в. Нова-Подымка Елізаветградскага пав. Херсонскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1943. У Чырв. Арміі з 1942. Вызначыўся ў Віцебскай вобл. 23.6.1944 аддзяленне аўтаматчыкаў на чале з І. адно з першых уварвалася ў г. п. Шуміліна, 24 чэрв. пад варожым агнём фарсіравала Зах. Дзвіну і захапіла плацдарм. Жыве ў Уфе.

ІШІМ, рака ў Каз. ССР, у Цюменскай і Омскай абласцях РСФСР, левы прыток Іртыша. Даўж. 2450 *км*, пл. бас. 177 тыс. *км*².

ІЫГІ (Jõgi) Олеў Адавіч (н. 9.1.1919, в-аў Сарэма), эстонскі савецкі літаратуразнавец і перакладчык. Чл. КПСС з 1945. Сын селяніна. У 1956 скончыў завочнае адд. рус. філалогіі Тартускага ун-та. Удзельнік Айч. вайны. З 1958 гал. рэдактар час. «Keel ja Kirjandus» («Мова і літаратура»). Як літ. крытык выступае з 1949. Аўтар зб. артыкулаў «Літаратурныя каардынаты» (1963). Перакладае з рус., бел. і польскай моў. Пераклаў на эст. мову зб. апавяданняў (1961) і аповесць «Апошнія сустрэча» (1961) Я. Брыля, аповесць В. Быкава «Трэцяя ракета» (1963), раманы І. Мележа «Людзі на балоце» (1964) і «Подых навальніцы» (1968). Удзельнічаў у выданні на эст. мове выбраных вершаў Я. Купалы (1966) і Я. Коласа (1968).

Тв.: Бел. пер.— Сённяшні дзень эстонскай літаратуры, «Полымя», 1972, № 1. *Х. Х. Пеэп.* Тарту.

І. пачынаецца на паўн. ускраіне Казахскага драбнасопачніка. У вярхоўі (да Цалінаграда) цячэ ў вузкай даліне. Ніжэй Петрапаўлаўска выходзіць на Ішымскі стэп. Гал. прытокі: левы — Тэрсакан, правыя — Калутон, Аканбурлук, Іманбурлук. Жыўленне пераважна снегавое і грунтавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 130 *м*³/*сек*. І. суднаходны ў ніжнім цячэнні; створаны Сяргееўскае (каля Петрапаўлаўска) і Вячаслаўскае (каля Цалінаграда) вадасховішчы. На І.— г. Цалінаград, Петрапаўлаўск, Ішым.

ІШЭМІЯ (грэч. ischō затрымліваю + haima кроў), малакроўе органа або яго ўчастка ад абмежаванага прытоку крыві. Бывае ад рэфлекторнай спазмы (ангіяспастычная), закупорвання артэрый або атэрасклерозу (абтурацыйная), ад сціскання жгутом, рубцом, пухлінай (кампрэсійная). Вынікам І. можа быць інфаркт (некроз).

Літ.: Давыдовский И. В. Общая патология человека, 2 изд., М., 1969.

Й

Й, адзінаццатая літара беларускага алфавіта. Зменена кірыліцкая «Н» («иже»), якая паходзіць з візант. «эты» («Н»), з дыякрытычным знакам. У бел. графіцы ўжываецца з канца 16 ст. (у рус. з 1735). У сучаснай бел. мове абазначае шумны глухі сярэднепаднябенны шчылінны мяккі зычны гук «й»: «гай», «май», «сейбіт».

ЙЕМЕН (Йеменская Арабская Рэспубліка), дзяржава на ПдЗ Аравійскага п-ва. Пл. 195 тыс. км². Нас. 5 млн. чал. (ацэнка, 1970). Сталіца Сана. Краіна падзяляецца на 8 ліваў (абласцей). Й.— рэспубліка. З 1967 улада належыць Рэспубліканскаму савету. У 1970 створаны часовы вышэйшы заканадаўчы орган — Кансультатыўны савет, які выбірае старшыню Рэспубліканскага савета і зацвярджае членаў урада.



Прырода. Й. пераважна горная краіна. ⅔ тэр. займаюць горы Джэбель выш. да 3600 м (г. Эн-Набі-Шаіб). На У ступеньчаты схіл да пустыні Руб-эль-Халі. Уздоўж узбярэжжа Чырвонага м. палосай 30—70 км цягнецца нізіна Тыхама, занятая саканчакова-пясчанай пустыняй. Карысныя выкапні: кам. соль, алебастр, графіт, золата, нафта, жал. і медная руды. На ўзбярэжжы клімат трапічны, гарачы і сухі. Сярэдняя т-ра студз. 20, чэрв. 30 °С, ападкаў 100 мм за год. У гарах клімат умерана кантынентальны, ападкаў 750—900 мм за год. У г. Сана (на выш. каля 2400 м) сярэдняя т-ра студз. 13,7, чэрв. 21 °С. У снеж.— лютым бываюць замаразкі. Рэкі на большай частцы краіны не маюць пасталаннага вадасцёку. Раслінасць на раўнінне пустынная і паўпустынная, на схілах гор — какцюсы). Жывёльны свет разнастайны.



Йеменская Арабская Рэспубліка. Вёска ў Тыхаме.

Насельніцтва. Большасць (каля 98%) — арабы. Жывуць індыйцы, персы, афрыканцы. Дзярж. мова — арабская, асн. рэлігія — іслам. У гарадах жыве 10% нас. Найб. гарады: Сана (100 тыс. ж., 1970), Таіз і Хадэйда.

Гістарычная даведка. Стараж. гісторыя Й. вывучана мала. У сярэдзіне 2-га тысячагоддзя да н. э. на яго тэр. пачало развівацца ірыгацыйнае земляробства. У 1-м тысячагоддзі да н. э. кансаліда валіся раннія рабаўладальніцкія дзяржавы Саба, Маін, Катабан і Хадрамаўт. Важнае значэнне для іх развіцця меў гандаль з краінамі Міжземнамор'я і з Індыяй. У пач. 4 ст. н. э. тэр. Й. падпала пад уладу Хім'ярыцкага царства. У гэты перыяд зараджаюцца феад. адносіны, пашыраюцца іудаізм і хрысціянства. У пач. 6 ст. тэр. Й. захапілі эфіопы, у 70-я г. 6 ст. — сасаніды (гл. *Сасанідаў дзяржава*). У канцы 6 ст. краіна распалася на дробныя ўладанні, якія ў 629—630 заваявалі арабы-мусульмане і ўключылі іх у Арабскі халіфат. Устанавіліся феад. адносіны, араба-мусульманская культура, пануючай рэлігіяй паступова стаў іслам. Некалькі стагоддзяў на тэр. Й. панавала міжусобіца, ішла барацьба паміж рознымі дынастыямі. У 16 ст. Й. падпарадкавалі туркі-асманы, але ў выніку агульнайеменскага антытурэцкага паўстання мусілі ў 1633 пакінуць краіну. Утварылася незалежная тэакратычная дзяржава на чале з зейдзіцкімі імамамі. У 1839 англічане захапілі раён Адэна, дзе пазней былі створаны брытанская калонія і пратэктараты Адэн (Усходні і Заходні). На астатняй тэр. аднавілася (1872) турэцкае панаванне. Пад націскам вызв. барацьбы, якую ўзначаліў імам Ях'я, тур. ўлады прызналі ў 1911 аўтаномію горнага Й. У 1919 Ях'я абвясціў сябе каралём Й. Паводле англа-йеменскага дагавору 1934 Вялікабрытанія прызнала незалежнасць Паўн. Й., але пакінула за сабою Адэн. У 1928 заключаны першы савецка-йеменскі дагавор аб дружбе і гандлі (дыпламатычныя адносіны з 1955). У 2-ю сусветную вайну Й. трымаўся нейтралітэту, у 1943 разарваў дыпламат. адносіны з Італіяй. Пасля вайны ў краіне ўзнік апазіцыйны імаму рух. У выніку змовы забіты (1948) Ях'я. Імамам стаў яго сын Ахмед [1948—62]. Неабмежаваная ўлада імама (з 1962 Махамед эль-Бадр), жорсткая эксплуатацыя выклікалі нездаволенасць насельніцтва.

26.9.1962 адбылася антыфеад. антыманархічная рэвалюцыя. Манархія была скінута, улада перайшла да Савета рэвалюцыі, Й. абвешчаны рэспублікай. У 1962 выдадзены закон пра адмену рабства і ліквідацыю ін-та заложнікаў, канфіскаваны землі членаў каралеўскай сям'і і актыўных прыхільнікаў манархіі. У 1963 упершыню ў Й. створана прафс. аб'яднанне. Незадаволеная прагрэс. мерапрыемствамі рэакцыя пры падтрымцы імперыялістаў Захаду распачала грамадз. вайну. У барацьбе супраць рэакцыі ПАР падтрымалі АРЕ (увяла ў ПАР свае войскі) і некат. інш. арабскія краіны. Пасля таго як пачалася *ізраільская агрэсія* супраць арабскіх краін 1967, АРЕ вывела свае войскі з тэр. ПАР. Гэта выкарысталі праманархічныя колы, у канцы 1967 — пач. 1968 арганізавалі наступленне наёмных атрадаў на г. Сана. Аднак упартае супраціўленне народа, падтрымка СССР, інш. сацыяліст. і большасці арабскіх краін сарвалі планы рэакцыі. У вер. 1969 рэсп. войскі авалодалі апорным пунктам манархістаў на Пн краіны. З 1967 улада ў краіне належыць Рэспубліканскаму савету. У знешняй палітыцы ўрад ПАР трымаецца курсу пазітыўнага нейтралітэту, дружалюбных адносін з краінамі, якія паважаюць суверэнітэт Йемена, выступае супраць імперыялізму і неакаланіялізму. У 1955 аднаўлены сав.-йеменскі дагавор 1928, у 1964 падпісаны новыя сав.-йеменскі дагавор аб дружбе і пагадненне аб эканам. і тэхн. супрацоўніцтве. Й.— чл. ААН з 1947.



Йемен. Атрады рэспубліканцаў ідуць на абарону сталіцы краіны ад манархістаў. 1968.


ЙЕМЕН
Маштаб 18 000 000
80 0 80 160 км
САНА
АДЭН
Муха
Хадэйда
Таіз
Шуара
Эль-Мукалла
Сейюн
Шэйх-Асман
Лахтума
Турба
Эль-Кутн
Эль-Гайда
Эль-Мухра
Эль-Хамра
Эль-Хаджара
Эль-Кара
Эль-Хаушаб
Эль-Хаджар
Эль-Хаджрын
Эль-Хаджрын
Эль-Хаджрын

К



К, дванаццатая літара беларускага алфавіта. Есць у алфавітах усіх славянскіх і большасці інш. індаеўрап. моў. Паходзіць з кірыліцкай «К» («кака»), запазычанай з візантыйскага ўстаўнага пісьма. У стараж.-рус. і старабеларускай пісьменнасці ў розны час было некалькі варыянтаў гэтае літары, яны памагаюць вызначыць час стварэння помніка. Мела лікавае значэнне 20. У сучаснай бел. мове абазначае глухі заднеязычны выбухны гук «к».

КААБА (з араб. ка'б — куб), мусульманскі храм у Меццы (Саудаўская Аравія), свяцілішча арабаў.

Чатырохвугольны будынак з мясцовага шэрага каменю даўжынёй 13 *м*, шыр. 12 *м*, выш. 15 *м*. У адной з сцен К. ніша з т. зв. «Чорным каменем» (стараж. фетышам). У старажытнасці К. — свяцілішча язычніцкіх плямёнаў Хіджаза. Пасля зававання Меккі мусульм. войскамі (630) стаў месцам паломніцтва мусульман.

КААГУЛЯЦЫЯ (лац. coagulatio згусанне, згушчэнне), узбуйненне часцінак дысперснай сістэмы і выпадзенне іх з раствору.

Устойлівасць калоідных сістэм (гл. *Калоідная хімія*) абумоўлена мінімальным памерам часцінак, здольных да броўнаўскага руху (кінетычная ўстойлівасць), і наяўнасцю падвойнага эл. слоя ці сальватнай абалонкі вакол часцінак (агрэгатыўная ўстойлівасць). Пры дабаўленні электраліту, змене прыроды асяроддзя, канцэнтрацыі, т-ры знікае агрэгатыўная і кінетычная ўстойлівасць, калоідная сістэма разбураецца, дысперсная фаза (гл. *Дысперсныя сістэмы*) каагулюе. Адрозніваюць скрытую К. (зменьваецца афарбоўка, вязкасць) і яўную (выпадаюць часцінкі ці расслойваецца эмульсія). Старэнне калоідных сістэм канчаецца К. Застудзяненне — К. гідрафільных калоідаў, часцінкі злінаюцца і ўтвараюць студзіну. Далейшае ўшчыльненне студзіны вядзе да сінэрэзісу (выціскання паміжструктурнай вадкасці). Тыксатрапія — крытычны стан устойлівасці калоідных сістэм: у стане спакою сістэма студзянее, пры ўстрэсванні ўстойлівасць аднаўляецца.

Літ.: Гл. пры арт. *Калоідная хімія*.

М. Ф. Ярмоленка. Мінск.

КААЛІН (ад назвы мясцовасці ў Кітаі), асадкавая гліністая горная парода, складзеная пераважна з *каалініту*. Прымесі кварцу, паляавых шпатаў і інш. К. — сыравіна ў керамічнай прамысл., выкарыстоўваецца ў металургіі, папяровай прамысл., пры вытв. гумы, алюмінію, сернакіслага гліназёму (для ачысткі пітной вады), ядахімікатаў, алоўкавых грыфеляў, у парфумерыі і касметычнай прамысловасці.

Колер белы з адценнямі. На вобмацак К. тлусты. У вільготным стане малапластычны, амаль не разбухае. Вогнетрывалы. Першасны К. утвараецца пераважна ва ўмовах вільготнага субтрапічнага і трапічнага клімату пры хім. выветрыванні горных парод, багатых на палявыя шпаты (гранітаў, гранадыярытаў і інш.); другасны — пры размыве і пераадкладанні першаснага. Залягае пластамі, лінзамі, гнёздамі, плашчападобна. На Беларусі К. выяўлены ў раёне Мікашэвіцка-Жыткавіцкага выступу крышталічнага фундаменту, дзе яны складаюць *кару выветрывання* граніта, граніта-гнейса, гранітызаваных гнейсаў і перакрываюцца адкладамі палеагену і неагену. Найб. радовішчы ў СССР (Украіна, Урал і інш.), Кітаі, Вялікабрытаніі, Чэхаславакіі, Францыі.

Літ.: Твердые полезные ископаемые БССР, Мн., 1970, с. 34—41; гл. таксама пры арт. *Гліна*.

КААЛІНІТ, гліністы мінерал, гідрасілікат алюмінію $Al_4(OH)_8[Si_4O_{10}]$. Ужываецца ў керамічнай прамысловасці.

Крышталі манаклінная сістэмы, пападаюцца ў тонказярністых агрэгатах з лускавінак ці пласцінак. Асобныя лускавінкі бясколерныя з перламутравым бляскам, у агрэгатах — белыя з рознымі адценнямі і матавым бляскам. Цв. каля 1, радзей 2,5—3; шчыльн. 2580—2630 *кг/м*³. Паходжанне пераважна экзагеннае. Гл. таксама *Каалін*.

КААЛІЦЫЙНЫ САВЕТ у Мінску, стачачны камітэт па кіраўніцтве рэвалюц. барацьбою працоўных Мінска ў час Кастрычніцкай усеагульнай забастоўкі 1905.

Утвораны пасля Курлоўскага расстрэлу 18.10. 1905 з прадстаўнікоў ад Мінскай групы РСДРП, Лібава-Роменскага к-та Усерасійскага чыгуначнага саюза, мясцовых к-таў эсэраў і Бунда. Большасць членаў былі бундаўцамі, меншавікамі і эсэрамі. 12 дзён трымаў пад сваім кантролем чыг. вузел, стварыў камісію ўзаемадапамогі, суд гонару.

Кр.: Хроника важнейших событий истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 1 (1883—1918 гг.), Мн., 1962, с. 116.

КААЛІЦЫЯ (лац. coalesco аб'ядноўваюся), паліт. ці ваенны саюз дзяржаў для сумесных дзеянняў на міжнар. арэне, а таксама пагадненне некалькіх паліт. партый пра ўтварэнне кааліцыйнага (змешанага па складзе) урада. У практыцы імперыяліст. краін пашыраны агрэсіўныя К. і *блокі*, дзейнасць якіх накіравана супраць СССР і сацыяліст. краін: НАТО (1949), СЕАТО (1954), СЕНТО (1955) і інш.

Літ.: Акопов Г. М. и Сухарьков И. А. Империалистические блоки: реальность и перспективы, М., 1969.

КААПЕРАВА́ННЕ ВЫТВОРЧАСЦІ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ КРАІН, гл. ў арт. *Савет Эканамічнай Узаемадапамогі, Інтэграцыя эканамічная*.

КААПЕРАВА́ННЕ Ў ВЫТВОРЧАСЦІ, форма арганізацыі вытворчасці, якой характэрны пастаянныя вытворчыя сувязі паміж гаспадарча самастойнымі прадпрыемствамі пры вырабе прамысловай (гл. *Каапераванне ў прамысловасці*) і сельскагаспадарчай (гл. *Каапераванне ў сельскай гаспадарцы*) прадукцыі. Характар кааперавання вызначаецца грамадскім ладам. Пры капіталізме вытв. сувязі ўзнікаюць стыхійна і ажыццяўляюцца манаполіямі для атрымання макс. прыбытку. Сацыяліст. К. ў в. мае планавы характар, накіравана на павышэнне эфектыўнасці грамадскай вытворчасці, садзейнічае комплекснаму развіццю эканам. раёнаў. Ва ўмовах эканам. садружнасці і тэр. падзелу працы паміж сацыяліст. краінамі каапераванне ажыццяўляецца ў межах усёй сацыяліст. сістэмы. Гл. таксама *Інтэграцыя эканамічная, Савет Эканамічнай Узаемадапамогі*.

КААПЕРАВА́ННЕ Ў ПРАМЫСЛО́ВАСЦІ, вытворчыя сувязі прадпрыемстваў, якія сумесна на аснове падзелу працы вырабляюць пэўную прадукцыю, але захоўваюць гаспадарчую самастойнасць.

У СССР асабліва пашырана ў машынабудаванні. Звязана з працэсам спецыялізацыі вытворчасці, садзейнічае больш поўнаму выкарыстанню вытв. магутнасцей прадпрыемстваў, далейшаму развіццю тэхнікі, ужыванню ў вялікіх маштабах высокапрадукцыйнага абсталявання, перадавой тэхналогіі і аўтаматызацыі вытворчасці. Дае магчымасць больш поўна і мэтазгодна выкарыстаць прамысловыя рэсурсы ў межах асобных эканам. р-наў, скараціць трансп. выдаткі, павысіць прадукцыйнасць працы. Пры К. ў п. ўзнікаюць наступныя вытв. сувязі: паміж прадпрыемствамі, якія па характары спецыялізацыі знаходзяцца ў непасрэднай залежнасці, і паміж прадпрыемствамі, якія не залежаць адзін ад аднаго. У першым выпадку прадпрыемствы-сумежнікі пастаўляюць галаўному прадпрыемству, якое вырабляе гатовую прадукцыю, паўфабрыкаты, дэталі, вузлы і інш.; у другім — прадпрыемствы кааперуюцца пры лішку вытв. магутнасцей на адным і пры дэфіцыце аналагічных магутнасцей на другім (форма ўзаемадапамогі па пастаўках дэталяў, паковак, штамповак, ліцця і выкананні розных відаў работ). Паводле галіновай прыналежнасці і тэр. размяшчэння прадпрыемстваў К. ў п. бывае: унутрыгалінавае, міжгалінавае, унутрыраённае і міжраённае. У БССР вытворчасць трактароў, аўтамабіляў, станкоў, тэлевізараў, гадзіннікаў і інш. прадукцыі заснавана на ўнутрыраённым і міжраённым каапераванні.

Літ.: Маркс К. Капітал, т. 1, Мн., 1952, раздз. 11; Ленін У. І. Па поваду так званага пытання аб рынках, Тв., т. 1 (Полн. собр. соч., т. 1); Касперович Е. К. Специализация и кооперирование в машиностроении Белорусской ССР, Мн., 1962; Коробов Г. Ю. Межреспубликанские и внутриреспубликанские кооперированные связи предприятий БССР, Мн., 1968; Орлов Н. А., Сластенко Е. Н. и Ямпольский Е. С. Специализация и кооперирование в промышленности СССР, М., 1964.

В. С. Майрышчай. Мінск.

КААПЕРАВА́ННЕ Ў СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДА́РЦЫ, аб'яднанне с.-г. прадпрыемстваў для вытворчасці, перапрацоўкі і рэалізацыі аднаго ці некалькіх відаў прадукцыі пры паслядоўным выкананні вытворчых аперацый адзінага тэхнал. працэсу. Развіваецца з паглыбленнем спецыялізацыі с.-г. вытворчасці.

Для вытворчасці і перапрацоўкі адпаведнай прадукцыі ў СССР ствараюцца аграпрамысл. аб'яднанні (комплексы, фірмы). У іх уваходзяць калгасы і саўгасы пэўнай спецыялізацыі, прамысл. прадпрыемствы па перапрацоўцы сыравіны (малочныя з-ды, мясакамбінаты, агародніна-плодакансервавыя камбінаты, ільнозаводы і інш.), а таксама транспартныя і гандл. арг-цыі. Развіваецца міжгасп. каапераванне: гаспадаркі малочна-агародніннага кірунку перадаюць маладняк буйн. раг. жывёлы на дарошчванне і адкорм спецыялізаваным калгасам і саўгасам; у свінагадоўлі гасп.-рэпрадуктары пастаўляюць парасят адкормачным гаспадаркам. Атрыманы прыбытак размяркоўваецца на аснове вызначаных дагаворам адносін. Пашыраная форма кааперавання ў сельскагаспадарчай вытворчасці — *міжкалгасныя арганізацыі*. З развіццём унутрыгасп. спецыялізацыі ўкараняецца каапераванне вытв. падраздзяленняў калгасаў і саўгасаў. Брыгады, фермы, вытв. ўчасткі будуюць свае адносіны на гаспадарчым разліку і заняты пэўным відам вытв. дзейнасці ў адзіным гасп.-тэхнал. працэсе.

Літ.: Соколов И. А. Межколхозные производственные связи, М., 1965; Тимошенко И. и Халитов Р. Некоторые вопросы хозяйственного расчета и распределения прибыли в совхозах-заводах, Кишинев, 1968; Кирьянов Д. П. Экономические взаимоотношения в межколхозных откормочных объединениях, «Труды Всесоюзного сельскохозяйственного ин-та заочного образования», 1970, в. 38.

В. Р. Крастоўскі. Мінск.

КААПЕРАТЫЎНАЕ ЖЫЛЛЁВАЕ БУДАЎНІЦТВА, гл. *Жыллёва-будаўнічы кааператыў*.

КААПЕРАТЫЎНА-КАЛГА́СНАЯ ЎЛА́СНАСЦЬ, гл. ў арт. *Грамадская сацыялістычная ўласнасць, Калгас*.

КААПЕРАТЫЎНАЯ АРГАНІЗА́ЦЫЯ, сацыялістычнае гаспадарчае добраахвотнае аб'яднанне працоўных для ўтварэння калектыўных прадпрыемстваў у асобных галінах нар. гаспадаркі на аснове грамадскіх сродкаў вытворчасці і калектыўнай працы. Віды К. а. ў СССР: *калгасы* (у т. л. рыбалавецкія), *спажывецкая кааперацыя* (сельспажыўтаварыствы, рай- і аблспажыўсаюзы і інш.), *жыллёва-будаўнічыя кааператывы*, дачна-будаўнічыя, т-вы садаводаў, кааператывы па буд-ве і эксплуатацыі калектыўных гаражоў і стаянак для аўтамабіляў індывід. уладальнікаў.

Права грамадзян аб'ядноўвацца ў К. а. прадугледжана арт. 126 Канстытуцыі СССР (арт. 101 Канстытуцыі БССР). К. а. в'яўляюцца юрыд. асобай і дзейнічаюць на аснове Прыкладных статутаў. Вышэйшы орган кіравання — агульны сход членаў К. а. (сход упаўнаважаных асоб), які выбірае праўленне і старшыню К. а. або праўлення. Праграма КПСС прадугледжвае павышэнне значэння кааперацыі як адной з формаў удзелу мас у камуніст. буд-ве, камуніст. выхаванні і школы грамадскага самакіравання.

Літ.: Миколенко Я. Ф. Право кооперативной собственности в СССР, М., 1961; Гликин Я. С. Правовое регулирование деятельности советской потребительской кооперации, М., 1967.

В. Ф. Чыгір. Мінск.

КААПЕРАТЫЎНЫ ПЛАН ЛЕНІНА, план пераўтварэння с. гасп. на сацыяліст. асновах шляхам паступовага добраахвотнага кааперавання дробных аднаасобных сялянскіх гаспадарак і далучэння асноўнай масы сялянства да працэсу сацыяліст. будаўніцтва праз *кааперацыю*; састаўная частка ленінскага плана пабудовы сацыялізма ў СССР. Заснаваны на саюзе рабочага класа і прац. сялянства. Аб'яд-

нанне дробных сялянскіх гаспадарак на прынцыпах сацыяліст. кааперацыі вядзе да *аграмаджвання вытворчасці* — неабходнай умовы пабудовы сацыялізма. Пры дыктатуры пралетарыяту кааперацыя сялян па сваёй сутнасці становіцца аднатыпнай з сацыяліст. прадпрыемствамі, а каап. шлях — найбольш просты, лёгкі і даступны сялянам, спалучае іх асабістыя інтарэсы і інтарэсы сацыяліст. дзяржавы. З развіццём найпрасцейшых формаў кааперацыі — спажывецкай і забеспячэнска-збытавой — дробныя вытворцы пераконваюцца ў перавагах каап. працы і пераходзяць да кааперацыі вытворчай, вышэйшай формай якой з'яўляецца *калгас*. Пры гэтым калект. сялянскія гаспадаркі атрымліваюць ад дзяржавы фін. дапамогу; на аснове індустрыялізацыі ствараецца мат.-тэхн. база перабудовы с. гасп.; вядзецца рашучая барацьба з кулацтвам. Актыўную падтрымку сялянству аказвае рабочы клас. Практ. ажыццяўленне гэтых мерапрыемстваў у СССР падрыхтавала ўмовы суцэльнай *калектывізацыі сельскай гаспадаркі*. З улікам канкрэтна-гістар. умоў К. п. Леніна і вопыт калгаснага буд-ва ў СССР выкарыстоўваюць пры пераўтварэннях с. гасп. краіны, якія сталі на шлях сацыялізма.

Літ.: Ленін У. І. Тв. [гл. Даведачны т., ч. 1 (Справочный т. к Полн. собр. соч., ч. 1)]; Праграма Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Мн., 1961; Ленинский кооперативный план и борьба партии за его осуществление, М., 1969; Соломахо С. Л. Осуществление ленинского кооперативного плана в Белоруссии, Мн., 1969; Шарапов Г. В. Ленинский кооперативный план и его международное значение, М., 1970; Бураков В. М. Развитие ленинского кооперативного плана в новом Примерном Уставе колхоза, Л., 1970.

І. М. Качура. Мінск.

КААПЕРАЦЫЯ (лац. cooperatio супрацоўніцтва), добраахвотныя масавыя аб'яднанні людзей для сумеснай гасп. дзейнасці. Асн. формы: *сельскагаспадарчая кааперацыя, прамысловая кааперацыя, спажывецкая кааперацыя, крэдытная кааперацыя*, жыллёвая (гл. *Жыллёва-будаўнічы кааператыў*). Характар і мэты К. залежаць ад грамадскага ладу.

Пры капіталізме К.— калектыўнае капіталіст. прадпрыемства. Правыя сацыялісты, каб звесці ў зман працоўных і аслабіць іх удзел у класавай барацьбе, сцвярджаюць, што праз К. працоўныя мобез класавай барацьбы знішчыць эксплуатацыю, пераўтварыць капіталіст. грамадства. На справе капіталіст. К. падпарадкоўваецца агульным законам капіталізму і непазбежна трапляе пад уплыў буйнога капіталу, не можа змяніць капіталіст. вытворчых адносін. Працоўныя капіталіст. краін выкарыстоўваюць кааператыўны рух для барацьбы за свае інтарэсы. Сацыялісты. К. грунтуецца на грамадскай сацыяліст. уласнасці на сродкі вытворчасці, што вызначае характэрныя рысы гэтай К.: сяў. Дзейнічае ў спалучэнні з агульнасць інтарэсектарам, стварае ўмовы для фарміравання камуніст. вытворчых адносін.

КААПЕРАЦЫЯ ПРАЦЫ, форма арганізацыі працы, пры якой многія работнікі супольна ўдзельнічаюць у адным ці розных, але звяза паміж сабою працэсах працы. Стварае новую, больш высокую прадукцыйную сілу, забяспечвае рац. выкарыстанне рабочага часу і сродкаў вытворчасці, паскарае тэмпы работ, змяншае затраты на выраб прадукцыі. Існуюць простая К. п., калі ўсе работнікі выконваюць аднародную работу, і складаная К. п., заснаваная на падзеле працы (гл. *Грамадскі падзел працы*) і выкарыстанні машын. К. п. абумоўлівае неабходнасць сістэмы кіравання для каардынацыі сумеснай дзейнасці калектыву, падпарадкавання вытв. працэсу волі кіраўніка. Кожны грамадскі лад мае характэрную К. п., якая адлюстроўвае ўзровень развіцця прадукцыйных сіл і вытв. адносін.

Пры першабытнаабшчынным ладзе існавала простая К. п. Яна грунтавалася на калект. уладанні сродкамі вытворчасці і працы свабодных ад эксплуатацыі людзей. Ва ўмовах рабства, феадалізму і капіталізму К. п. заснавана на прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці і эксплуатацыі рабоў, прыгонных сялян і наёмных рабочых. Капіталіст. К. п. ў сваім развіцці праходзіць 3 стадыі ад простай капіталіст. К. п. да *мануфактуры* і *фабрыкі*, якія з'яўляюцца ступенямі ўзмацнення эксплуатацыі наёмных рабочых, павелічэння адноснай прыбавачнай вартасці. Як і кіраванне вытворчасцю, К. п. пры капіталізме мае супярэчлівы, дваісты характар: з аднаго боку, павышае прадукцыйную сілу працы, з другога — узмацняе эксплуатацыю працоўных і ў адносінах да іх прымусовая, дэспатычная.

Пры сацыялізме К. п. грунтуецца на грамадскай уласнасці на сродкі вытворчасці. Гэтым вызначаюцца і яе характэрныя прынцыпы: таварыскае супрацоўніцтва і ўзаемадапамога, агульнасць інтарэсаў свабодных ад эксплуатацыі работнікаў, планамернасць арганізацыі як на асобных прадпрыемствах, так і кааперараванне ў вытворчасці ў маштабе ўсёй краіны, а з узнікненнем і развіццём сусв. сацыяліст. сістэмы — у маштабе эканомікі гэтых краін (гл. *Інтэграцыя эканамічная, Савет Эканамічнай Узаемадапамогі*). Сацыяліст. К. п. арганічна спалучае развіццё прадукцыйных сіл на базе навук.-тэхн. прагрэсу з павышэннем дабрабыту работнікаў, ростам іх кваліфікацыі і культ. ўзроўню. Кіраўнік сацыяліст. прадпрыемства дзейнічае ў інтарэсах калектыву, дзяржавы, карыстаецца давер'ем, падтрымкай калектыву. Агульнасць інтарэсаў, зацікаўленасць членаў калектыву ў павышэнні эфектыўнасці вытворчасці стымулююць творчыя адносіны да працы, што выяўляецца ў сацыялістычным спаборніцтве, развіцці грамадскіх формаў кіравання вытворчасцю, у руху за камуністычную працу. Гл. таксама *Кааперацыя, Кааперараванне ў вытворчасці, Кіраванне вытворчасцю*.

Літ.: Маркс К. Капітал, т. 1, Мн., 1952, раздз. 11, 12, 13; Ленін У. І. Вялікі пачын, Тв., т. 29 (Полн. собр. соч., т. 39).

У. А. Салановіч. Мінск.

КААПТАЦЫЯ (лац. cooptatio давыбары), увядзенне ў склад выбарнага органа новых членаў і кандыдатаў рашэннем самога органа без дадатковых выбараў. У выбарных органах СССР не дапускаецца.

КААРДЫНАТОГРАФ, прылада для пабудовы каардынатных сетак і нанясення пунктаў па іх каардынатах пры складанні тапаграфічных картаў ці планаў.

К. мае дзве ўзаемна перпендыкулярныя лінейкі (гл. рыс.): накіроўную (*1*) і рухомую (*2*). Лінейка (*2*) рухаецца разам з кареткай (*3*) і мае ўласную каретку з іголкай і мікраскопам. Іголка ставіцца ў адпаведнасці са значэннямі прамавугольных каардынат пункта па шкалах лінеек уручную ці аўтаматычна. У апошнім выпадку К. абсталёўваецца



1 — накіроўная лінейка; *2* — рухомая лінейка; *3* — каретка рухомай лінейкі.

па рэгістравальным лічыльна-рашальным прыстасаваннем. Гл. таксама *Геадэзічныя інструменты*.

І. І. Купчынаў. Гомель.

КААРДЫНАТЫ (лац. со разам+ordinatus упарадкаваны) у матэматыцы, сістэма лікаў ці іншых сімвалаў, якія вызначаюць становішча матэм. аб'екта (пункта) на зададзенай лініі, паверхні, у трохмернай прасторы ці ў абагульненай геам. прасторы.

Паміж сістэмамі лікаў і пунктамі прасторы ўстанаўліваецца ўзаемна адназначная адпаведнасць, якая можа быць зададзена мноствам спосабаў. Спосаб (правіла) задання адпаведнасці —



сістэма каардынат (СК). Тры ўзаемна перпендыкулярныя накіраваныя прамыя *OX*, *OY*, *OZ* (восі К.) з агульным пунктам *O* (пачатак К.) і адзіным маштабам для ўсіх трох восей ствараюць прамавугольную дэкартаву СК, у якой кожны пункт *A* прасторы вызначаецца трыма сапраўднымі лікамі *x*, *y*, *z* — *A*(*x*, *y*, *z*). Каардыната *x* (абсцыса) — пункт перасячэння восі *OX* з плоскасцю, праведзенай праз пункт *A* паралельна плоскасці *YOZ*. Аналагічна вызначаюцца ардыната *y* і апліката *z* (рыс. *а*). Калі восі К. не ўзаемна перпендыкулярныя і маштабныя адрэзкі іх розныя, то атрымліваецца агульная дэкартава (афінная) СК. Кожную з каардынатных плоскасцей *XOY*, *YOZ*, *ZOX* можна разглядаць як плоскасць з самастойнай прамавугольнай дэкартавай СК; так, пункт A_1 на плоскасці *XOY* мае К. (*x*, *y*). Становішча пункта A_1 на плоскасці можна вызначыць і ў палярнай СК — $A_1(\rho, \varphi)$, дзе ρ — даўжыня адрэзка *OA*, φ — вугал паміж адрэзкам OA_1 і прамянём *OX* (палярная вось), пры гэтым задаецца ўмова $0 \leqslant \varphi < 2\pi$. Прамавугольная СК у прасторы, дзе К. (*x*, *y*) заменены палярнымі (ρ φ), наз. цыліндрычнай (рыс. *б*). У геадэзіі, астраноміі і інш. навуках выкарыстоўваюцца сферычныя К. і іх разнавіднасці (гл. *Каардынаты геадэзічныя, Каардынаты геаграфічныя, Нябесныя каардынаты*). Метад каардынат — аснова *аналітычнай геаметрыі*, а яго абагульненне на шматмерныя прасторы знаходзіць дастасаванні ў матэматыцы, механіцы і ў некат. раздзелах фізікі.

Літ.: Гельфанд И. М., Глаголева Е. Г. и Кириллов А. А. Метод координат, 3 изд., М., 1968; Корн Г. и Корн Т. Справочник по математике..., пер. с англ., 2 изд., М., 1970.

С. У. Доўнар. Мінск.

КААРДЫНАТЫ ГЕАГРАФІЧНЫЯ (даўгата і шырата), вуглавыя велічыні, якія вызначаюць знаходжанне пунктаў на зямной паверхні.



Геагр. шырата φ вымяраецца вуглом паміж лініяй, перпендыкулярнай узроўневай паверхні ў зададзеным пункце, і плоскасцю экватара. Шыроты адлічваюцца ад 0 да 90° па абодва бакі ад экватара. У паўн. паўшар'і шыроты наз. паўночнымі, у паўд. — паўднёвымі. Геагр. даўгата λ або *L* вымяраецца вуглом паміж плоскасцямі пачатковага меридыяна і меридыяна дадзенага пункта. Даўготы па У ад пачатковага меридыяна, ад 0 да 180°, наз. ўсходнімі, а на З — заходнімі. Паводле міжнар. пагаднення ў большасці краін свету, у т. л. і ў СССР, за пачатковы меридыян прыняты грынвічскі, які праходзіць праз ранейшае месца размяшчэння Грынвічскай абсерваторыі (у Лондане) да яе пераводу ў замак Хёрстмансо.

КААРДЫНАТЫ ГЕАДЭЗІЧНЫЯ, велічыні, якія вызначаюць становішча пунктаў на Зямлі і ў калязямной прасторы адносна паверхні зямнога эліпсоіда.



Звычайна К. г.— шырата, даўгата і вышыня. Шырата *B* пункта *M* — вугал паміж нармаллю да паверхні эліпсоіда і плоскасцю экватара; даўгата *Z* пункта *M* — двухгранны вугал паміж плоскасцямі меридыяна зададзенага пункта і пачатковага (грынвічскага) меридыяна (гл. рыс.). Вышыня *H'* — адрэзак нармалі ад зададзенага пункта да паверхні эліпсоіда, пры гэтым $H' = H + h$, дзе *H* — вышыня пункта Зямлі над паверхняй *геоіда*, *h* — перавышэнне паверхні геоіда над паверхняй эліпсоіда. Геадэзічную шырату і даўгату пунктаў у СССР вылічваюць ад зыходнага пункта «Пулкава» метадамі *трыянгуляцыі*, а вышыню — ад нуля Кранштацкага футштока *нівеліраваннем*. На практыцы часта выкарыстоўваюцца і інш. сістэмы каардынат (гл. *Каардынаты*): для вызначэння К. г. пунктаў у прасторы — прамавугольная дэкартава сістэма каардынат з пачаткам у цэнтры зямнога эліпсоіда; для вызначэння планавага становішча пунктаў на параўнальна невялікіх аб'ектах — прамавугольная сістэма каардынат на плоскасці; для інж. работ — сістэма занальных плоскіх прамавугольных каардынат у праекцыі Гаўса — Кругера з пачаткам каардынат у пункце перасячэння восевага (сярэдняга) меридыяна шасціградуснай зоны з экватарам. Гл. таксама *Красоўскага эліпсоід*.

Літ.: Закатов П. С. Курс высшей геодезии, 3 изд., М., 1964; Ганьшин В. Н. и др. Инженерная геодезия, М., 1968.

І. І. Купчынаў. Гомель.

КААРДЫНАЦЫЙНАЯ СУВЯЗЬ, гл. ў арт. *Хімічная сувязь*.

КАБАКІ, вёска ў Першамайскім с/с Бярозаўскага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр саўгаса «Бярозаўскі». За 15 км на З ад Бярозы, 96 км ад Брэста, 12 км ад чыг. ст. Бяроза-Картузская. 938 ж., гасп. 276 (1971). Спіртавы, цагельны, вашнавы з-ды, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіця-

чы сад, фельч.-ак. пункт, вет. пункт, аддз. сувязі, сталовая, 2 магазіны. У гады бурж. Польшчы ў К. дзейнічалі падпольныя ячэйкі КПЗБ і КСМЗБ.

КАБАКЧЫЕЎ Хрыста Стэфанаў [2(14).1. 1878, г. Галац, Румынія — 6.10.1940], дзеяч балгарскага і міжнар. рабочага руху. З 1897 чл. Балг. рабочай с.-д. партыі (БРСДП). У 1905—28 чл. ЦК партыі. Удзельнік Штутгарцкага (1907), Капенгагенскага (1910) і Базельскага (1912) кангрэсаў 2-га Інтэрнацыянала. У 1910—23 гал. рэдактар цэнтр. органа партыі газ. «Работнически вестник». У 1914—23 дэп. парламента. Удзельнічаў у рабоце II—IV, VI кангрэсаў Камінтэрна. У 1920 пазнаёміўся з У. І. Леніным. У 1923 сакратар ЦК БКП. У 1923 арыштаваны і ў 1925 зняволены за рэвалюц. дзейнасць. У 1926 эміграваў у Вену, потым (1927) у СССР. З 1928 чл. ВКП(б). Навук. супрацоўнік Ін-та Маркса — Энгельса — Леніна і Ін-та гісторыі АН СССР. Вывучаў гісторыю БКП, гісторыю Балгарыі і міжнар. рабочага руху.



Тв.: Избрани произведения, София, 1953.
Літ.: Колева Т. Христо Кабакчиев. Биобиблиография, София, 1958.

КАБАЛА (араб. абавязацельства), 1) даўгавое абавязацельства. У Расіі пашырана ў 15—17 ст. (з 16 ст. ў пісьмовай форме, т. зв. кабальныя граматы).

Існавала ў розных відах: пазыковая (беспрацэнтная або працэнтная), закладная (пад заклад маёмасці), служылая (адпрацоўка працэнтаў з доўгу), выкупная (купля-продаж перухомай маёмасці або даўжніка) і інш. К. — адна з формаў запрыгоньвання сялян (гл. *Кабальныя халопы*).

2) Перан. — прыгнёт, цяжкая форма асабістай залежнасці.

КАБАЛАМІН, вітамін, гл. *Цыянкабаламін*.

КАБАЛЕЎСКІ Дзмітрый Барысавіч [н. 17(30).12.1904, Пецярбург], рускі савецкі кампазітар, музычны пісьменнік і грамадскі дзеяч. Нар. арт. СССР (1963). Правадз. чл. АПН СССР (1971), чл.-кар. Германскай АМ (ГДР; 1970). Д-р мастацтвазнаўства (1965). Чл. КПСС з 1940. Чл. Сусв. Сав. Міру (1955—59). Віцэ-прэзідэнт Інтэрнац. т-ва муз. выхавання (1964—70). Скончыў Маск. кансерваторыю па кампазіцыі (1929, клас М. Мяскоўскага) і фп. (1930), з 1939 праф. гэтай кансерваторыі. Працуе ў большасці муз. жанраў, аддаючы перавагу сучаснай сав. тэматыцы. Напісаў шмат твораў для дзяцей. З твораў: оперы «Кала Брунь-ён» (1937, 2-я рэд. 1968), «Тарасава сям'я» (паст. 1950), «Мікіта Вяршынін» (1954), «Сёстры» (1967); «Рэквіем» на словы Р. Раждественскага (1963), вак.-сімф. сюіта «Народныя мсціўцы» (1942), кантата «Песня раніцы, вясны і міру» (1958); 4 сімфоніі, канцэрты для фп. (3), скрыпкі (1), віяланчэлі (1) з арк.; 3 санаты, 24 прэлюдыі для фп. Дэп. Вярх. Савета СССР 7—8-га скл. Дзярж. прэміі СССР 1946, 1948, 1951, Дзярж. прэмія РСФСР імя Глінкі 1966. Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі.



Літ. тв.: Избранные статьи о музыке, М., 1963; Про трех китов и про многое другое, М., 1970.
Літ.: Данилевич Л. Творчество Д. Б. Кабалевского, М., 1963; Пожидаев Г. Дмитрий Борисович Кабалевский, М., 1970.

А. А. Саламаха. Мінск.

КАБАЛЬНЫЯ ХАЛОПЫ (кабальныя людзі), катэгорыя феадальна залежнага насельніцтва ў Рускай дзяржаве 15—17 ст.

За грашовую пазыку селянін павінен быў асабіста адпрацоўваць крэдытору працэнты і да часу, пакуль не верне пазыкі, станавіўся К. х. Найчасцей К. х. не меў магчымасці вярнуць пазыку, бо яго заробак ішоў на выплату працэнтаў. Залежнасць К. х. вызначалася спец. дакументам — служылаю граматаю (кабалою). Паводле ўказаў 1586 і 1597 К. х. абавязаны былі працаваць на пазыкадаўцаў да іх смерці, нават пры ўмове выплаты пазыкі. Злоўленых беглых К. х. пазыкадаўцы ператваралі ў поўных *халопаў*. У пач. 18 ст. К. х. прыроўнены да прыгонных сялян.

Літ.: Ключевский В. О. Подушная подать и отмена холопства в России, Соч., т. 7, М., 1959; Яковлев А. Холопство и холопы в Московском государстве XVII в., т. 1, М.— Л., 1943.

КАБАЛЬЦІН (кобальтавы бліскучак), мінерал, сульфід кобальту і мыш'яку CoAsS. Руда, з якой атрымліваюць кобальт.

Змяшчае Co да 34%, прымесі Fe да 16% (ферокабальцін), Ni і Sb. Крышталі — актаэдры, кубы ці пентаганальныя дадэкаэдры кубічнай (паводле інш. крыніц — манаклінная ці рамбічная) сістэмы, са штрыхоўкай на гранях. Агрэгаты вярністыя. Колер серабрыста-белы ці сталёва-шэры з ружовым адценнем. Бляск металічны. Цв. 5—6; шчыльн. 6000—6500 *кг/м*³. Сустракаецца ў высока- і сярэднетэмпературных гідратэрмальных жылах.

КАБАНАЎ Павел Антонавіч (н. 20.5.1920, в. Нагорнае Судагодскага пав. Уладзімірскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1950. У Чырв. Арміі з 1941. Вызначыўся ў Бешанковіцкім р-не Віцебскай вобласці. 24.6.1944 стралк. аддзялення на чале з К. пад агнём ворага пераправілася цераз Зах. Дзвіну, заглушыла агнявыя кропкі ворага, чым садзейнічала пераправе палка. Жыве ў г. Жукоўскім Маскоўскай вобл.

КАБАНАЎКА, вёска ў Жлобінскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Камуніст». За 37 *км* на Пд ад Жлобіна, 100 *км* ад Гомеля, 17 *км* ад чыг. ст. Яшчыцы, 3,5 *км* ад Бярэзіны (прыток Дняпра). 270 ж., гасп. 82 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, швейная майстэрня, магазін. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў і партызан Айч. вайны.

КАБАРГА (Moschus moschiferus), млекакормячая жывёла сям. кабарговых атр. парнакапытных (некат. сістэматыкі адносяць К. да сям. аленевых). Пашырана К. ва Усх. Сібіры (акрамя паўн. абласцей), на Алтаі, Д. Усходзе, у Саянах, Кітаі, Карэі, Паўн. Манголіі.

Даўж. да 1 *м*, маса 15—20 *кг*, выш. ў карку да 70 *см*. Спіна выгнутая. Задняя частка цела вышэйшая і грузнейшая за пярэднюю. Поўсць густая, грубая, пераважна карычневая са светлымі плямамі на баках. Рагоў няма. У самцоў востры, накіраваны ўніз іклы, на жываце мускусная залоза (гл. *Мускусныя залозы*). Жыве К. ў горнай камяністай тайзе. Перамяшчаецца скачкамі. Расліннаедная. Прыплод 1—2 дзіцяняці. Аб'ект промыслу.

Літ.: Флинт В. Е., Чугунов Ю. Д. и Смирин В. М. Млекопитающие СССР, 2 изд., М., 1970.

КАБАРДЗІНА-БАЛКАРСКАЯ АЎТАНОМНАЯ САВЕЦКАЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ РЭСПУБЛІКА (Кабардзіна-Балкарыя), у складзе РСФСР. Утворана 5.12.1936. Размешчана на паўн. схілах і перадгор'ях Вял. Каўказа. Пл. 12,5 тыс. *км*². Нас. 600 тыс. чал. (1971). Падзяляецца на 8 раёнаў; 7 гарадоў, 7 гар. пасёлкаў. Сталіца Нальчык. Канстытуцыя прынята X Надзвычайным з'ездам Саветаў рэспублікі 24.6.1937, зацверджана Вярх. Саветам РСФСР 2.6.1940. Вышэйшы орган дзярж. улады — Вярх. Савет, які выбіраецца на 4 гады, а ў перыяд паміж сесіямі — Прэзідыум Вярх. Савета. Выканаўча-распарадчы орган — Савет Міністраў. Мясцовыя органы дзярж. улады: раённыя, гар., пасялковыя, сельскія і станічныя Саветы дэп. працоўных. Суд. сістэма: Вярх. суд К.-Б. АССР і раённыя нар. суды.

Прырода. ⅔ тэр. займаюць горы і перадгор'і. На Пд і ПдЗ найвыш. горныя вяршыні Вял. Каўказа: Эльбрус 5642 *м*, Дыхтау 5203 *м*, Шхара 5058 *м* (на граніцы з Груз. ССР), Суган 4489 *м* і інш. На Пн і ПнУ горы ўступамі паніжаюцца і пераходзяць у нізіну. Карысныя выкапні: вальфрама-малібдэнавыя, поліметалічныя, алюмініевыя, жал. руды, мыш'як, кам. і буры вугаль, буд. матэрыялы. Мінер. крыніцы (больш за 100). Клімат кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. —4, ліп. 24 на раўніне, —4,5 і 21,4 °С у перадгор'ях. Ападкаў ад 400 *мм* на раўніне да 800 *мм* і больш у гарах. Вегет. перыяд 150 дзён. Рэкі горныя (Церак з прытокамі Урух, Лескен, Чэрэк, Баксан, Малка і інш.). Глебы на раўніне і перадгор'ях чарназёмныя і цёмна-каштанавыя, у далінах рэк лугавыя, на схілах гор горна-лугавыя. Расліннасць разнастайная (больш за 3 тыс. відаў). 16,4% тэр. пад лесам (пераважна бук, дуб, граб да выш. 2700 *м*, вышэй бяроза, вольха і хвойныя). Пояс лясоў у гарах зменьваюць субальпійскія і альпійскія лугі.

Насельніцтва. Кабардзінцы і балкарцы (53,6%), рускія (37,1%). Жывуць украінцы, асеціны і інш. Кабардзінцы насяляюць раўніну і перадгор'і, балкарцы — горныя раёны. Сярэдняя шчыльн. 48 чал. на 1 *км*². Гарадскога нас. 53%. Гарады: Нальчык (165 тыс. ж., 1971), Прахладны, Майскі, Тырныауз і інш.

Гістарычны нарыс. Тэр. К.-Б. заселена з часоў палеаліту. У 5 ст. да н. э. продкі кабардзінцаў

Возера ў Чэрэкскай цясніне.





Нальчык. Плошча імя 400-годдзя добраахвотнага ўз'яднання Кабарды з Расіяй.

(меоты, сінды) утварылі раннерабаўладальніцкую дзяржаву Сіндыка, якая пазней увайшла ў *Баспорскую дзяржаву*. Нашэсце гуна ў (4 ст. н. э.) затрымала гістар. развіццё кабардзінцаў. Феад. адносіны ў іх складваліся ў 9—10 ст. У 13—15 ст. насельніцтва К.-Б. залежала ад мангола-татараў. У барацьбе супраць панавання Крымскага ханства і Турцыі кабардзінцы папрасілі дапамогі ў Расіі. У 1557 Кабарда, пазней і Балкарыя, добраахвотна ўвайшлі ў Рас. імперыю, што пазбавіла іх ад інтэрвенцкага завалявання і ўмацавала эканам. і культурныя сувязі з Расіяй. Прыгонніцкая эксплуатацыя няраз выклікала сялянскія хваляванні (1767, 1804, 1837, 1838, 1854). Працоўныя К.-Б. актыўна ўдзельнічалі ў рэв. 1905—07. У 1913 адбыліся сялянскія антыпамешчыцкія паўстанні. У 1915—16 узнікла падпольная рэвалюц.-дэмакр. група горскай беднаты «Карахалк» («Беднота»). Сав. ўлада абвешчана на 1-м Народным з'ездзе Саветаў у Нальчыку (18—23.3.1918). У кастр. 1918 — сак. 1920 на тэр. К.-Б. адбываліся баі з белагвардзейцамі. Канчаткова Сав. ўлада ўстаноўлена 23.3.1920. Адным з вядомых арганізатараў барацьбы за Сав. ўладу быў Б. Э. Калмыкоў. У студз. 1921 Кабарда і Балкарыя ўвайшлі ў склад Горскай АССР на правах акруг. 1.9.1921 у складзе РСФСР створана Кабардзінская аўт. вобл., 16.1.1922 — аб'яднаная К.-Б. аўт. вобл. (з 5.12.1936 — К.-Б. АССР). У Вял. Айч. вайну на тэр. К.-Б. ішлі цяжкія баі (жн.— снеж. 1942). За гераізм у Айч. вайну больш як 12 тыс. воінаў з К.-Б. ўзнаг. ордэнамі і медалямі, 20 з іх прысвоена званне Героя Сав. Саюза. Ураджэнцы з К.-Б. ўдзельнічалі ў баях і на тэр. Беларусі. Сярод абаронцаў Брэсцкай крэпасці — А. Калмыкоў, У. Мулаеў, Ш. Хубіеў, Т. Байзулаеў, Д. Джапуеў; сярод партызанаў Беларусі — камісар партыз. атрада У. М. Кульчаеў, камандзір партыз. атрада Д. А. Канкулаў. Пры вызваленні Віцебшчыны вызначыўся (чэрв. 1944) Герой Сав. Саюза І. І. *Лазараў*. У 1944 К.-Б. пераўтворана ў Кабардзінскую АССР, у 1957 адноўлена К.-Б. АССР. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна (1934, 1957).

Народная гаспадарка. Прамысловасць створана за гады Сав. улады. Гал. галіны: горназдабыўная, машынабудаўнічая і прыладабуд., каляровая металургія, хімічная. У Тырныаузе вальфрама-малібдэнавы камбінат. З-ды маш.-буд., станкабуд., гідраметалургічны, электраприлад (Нальчык), «Каўказкабель», рамонтны (Прахладны), нізкавольтавай апаратуры (Тырныауз), біяхімічны, шынарамонтны (Нарткала), рэнтгенаўскай апаратуры (Майскі), алмазных прылад (Церак) і інш. Харч. прамысловасць (кансервавая, мясная, мукамольная, кандытарская, спіртавая, вінаробная, крухмалапатачная, сыраварная), лёгкая



(вытв. валакна з кенафу і капапель, камбінат штучнай скуры і інш.). Прамысловасць буд. матэрыялаў, дрэваапрацоўка (мэблевая ф-ка ў Нальчыку). На р. Баксан ГЭС. У складзе с.-г. угоддзяў 50% ворных зямель, 38,2 пашы, 10,6 сенажацяў, 1,2% садоў і вінаграднікаў. У К.-Б. 75 калгасаў і 35 саўгасаў (1971). Пасяўная пл. (тыс. *га*, 1970) 332, з іх пад збожжавымі 154, тэхн. 41,1, агародніна-бахчавымі і бульбай 15,7, кармавымі 124,6. Асн. культуры (тыс. *га*): азімая пшаніца 72,5, сланечнік 29,8 і паўд. канаплі 9,9. Жывёлагадоўля мяса-малочнага кірунку. У 1971 было (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 261,8 (у т. л. кароў 97,6), авечак і коз 375,3, свіней 96,9, коней 20. Даўж. чыгунак 133 *км*, аўтамаб. дарог 1536 *км*, у т. л. 1155 *км* з цвёрдым пакрыццём (1969).

Ахова здароўя. У 1913 на тэр. сучаснай К.-Б. АССР было 2 бальніцы на 20 ложкаў (1,2 на 10 тыс. ж.), 1 амбулаторыя, 11 урачоў (0,7 на 10 тыс. ж.), 8 чал. сярэдняга мед. персаналу (0,5 на 10 тыс. ж.). У 1940: 37 бальнічных устаноў на 1390 ложкаў (38,3 на 10 тыс. ж.), 109 амбулаторый і паліклінік, 246 урачоў (5,7 на 10 тыс. ж.), 842 чал. сярэдняга мед. персаналу (23,2 на 10 тыс. ж.). На пач. 1971: 48 бальнічных устаноў на 4980 ложкаў (83,7 на 10 тыс. ж.), 74 амбулаторыі і паліклінікі, 1559 урачоў (26,2 на 10 тыс. ж.), 5002 чал. сярэдняга мед. персаналу (84 на 10 тыс. ж.), 10 санаторыяў і дамоў адпачынку, 3 пансіянаты. Курорт Нальчык, санаторыі: імя Калмыкова, імя Кірава, Нартан, Эльбрус, Церак, дом адпачынку «Зара» і інш.

Культура. Да Кастр. рэвалюцыі кабардзінцы і балкарцы не мелі сваёй пісьменнасці; у 1914/15 вуч. г. у агульнаадук. школах вучылася 6,7 тыс. чал. Сярэдніх спец. і вышэйшых навуч. устаноў не было. Пры Сав. уладзе створана пісьменнасць, ажыццёўлена ўсеагульнае абавязковае навучанне на роднай мове. У 1970/71 навуч. г. працавала 287 агульнаадук. школ усіх тыпаў (141,4 тыс. вучняў), 10 сярэдніх спец. навуч. устаноў (9,7 тыс. навучэнцаў), *Кабардзіна-Балкарскі універсітэт*. У рэсп. (1971) 2 музеі, 240 масавых б-к, 238 клубных устаноў, 220 кінаўстановак, тэлецэнтр; ёсць н.-д. ўстановы, выд-ва. У 1970 выдадзена 137 назваў кніг тыражом больш як 600 тыс. экз., выходзілі часопіс, 12 газет, у т. л. рэсп.: «Ленин гъуэгу» («Ленінскі шлях»), «Коммунизмге джол» («Шлях да камунізма»), «Кабардино-Балкарская правда». Багаты каб. і балк. фальклор, асабліва *нарцкі эпас*. Першую спробу стварыць пісьменнасць зрабілі ў 19 ст. Ш. Ногмаў, Казы Атажукін. Першыя маст. творы пісалі каб. паэты В. Пачаў, П. Кешокаў, балкарац К. Мечыеў. Каб. пісьменнасць засн. ў 1923, балкарская ў 1924. Л-ра развіваецца па шляху сацыялісг. рэалізму. Найб. вядомы прадстаўнік каб. л-ры Алі Шагенцукаў (публіцыст, вершы, раман у вершах «Камбот і Ляпа», паэмы); значны ўклад зрабілі П. Шэхікачаў, Т. Барукаеў, С. Кажаеў, Дж. Налоеў, раманісты А. *Кешокаў* («Вяршыні не спяць», 1960—66), Х. Таунаў («Род Шагемокавых»), А. Шамахаў, Адам Шагенцукаў і інш., драматургі А. Шартанаў, З. Аксіраў, М. Тубаеў. Вядома лірыка А. Кешокава, Адама Шагенцукава, балк. паэта К. *Куліева*. З балк. пісьменнікаў найб. вядомыя К. Атараў, В. Гуртуеў, І. Баташаў, Ж. Заліханаў. На бел. мову перакладаліся паасобныя творы Куліева, А. Кешокава, Т. Зумакулавай і інш.

На тэр. К.-Б. збераглося шмат стараж. могільнікаў, курганоў, влл. гарадзішчаў (Ніжні Джулат, Лыгыт). Ад сярэдневякоўя асталіся крапасныя збудаванні (Усхур-Кала), жылыя ўмацаваныя вежы (вежа Абал і інш.). Развіваліся традыц. нар. рамёствы: разьба па косці і камені, вышыўка золатам на жаночым адзенні, выраб метал. зброі, пасудаў, посуду і інш. рэчаў, аздобленых гравіроўкаю, чэрню, сканню. Балкарцы выраблялі лямцавыя дываны з уваленым геам. узорам і ўзорам з влл. рогападобных фігур. Кабардзінцы плялі цыноўкі з геам. узорам. У сав. час вядзецца вял. буд-ва ў Нальчыку (арх. І. і А. Лысяковы, Л. Цімоніна, М. Хлуднеўскі), забудоўваюцца гарады Тырныауз, Майскі, Нарткала, створаны комплекс спарт., турыст. збудаванняў у Прыэльбруссі (арх. В. Маргуліс). Паспяхова развіваецца выяўл. мастацтва: жывапіс (М. Гусачэнка, М. Ванах, М. Трындык, А. Жэрэштыеў), графіка (А. Глухаў, В. Арленка, П. Панамарэнка), скульптура (К. Крымшамхалаў, М. Тхакумашаў, Г. Бжэумыхаў).

Кабардзінская і балкарская музыка багатая на песенныя і танц. жанры. Лады дыятанічныя. Сустракаецца шматгалоссе ў форме рэчытатыву або мелодыі на фоне вытрыманых гукаў хору ці муз. інструментаў. З танцаў папулярныя кафа, удж, ісламей. Нац. муз. інструменты: камыль (род падоўжнай флейты), шычэпшын (род скрыпкі), пхачыч (ударны). У сав. час побач з пашыраннем тэматыкі ўзбагачаецца меладычнай, ладавай і рытмічнай структура нар. песень, сцвярджаецца шматгалосы харавы стыль. Сярод майстроў нар. творчасці: В. Казіеў, К. Кашгірава, Б. Пачаў, А. Хаўпачаў. У Нальчыку працуюць філармонія з сімф. аркестрам, ансамбль песні і танца, муз. школы і вучылішча, дом нар. творчасці, аддз. Саюза кампазітараў РСФСР (з 1959).

Вытокі тэатр. мастацтва К.-Б. ў стараж. тэатралізаваных нар. абрадах, у выступленнях нар. спевакоў-імправізатараў джогуака. Пасля ўстанаўлення Сав. улады ствараюцца драм. гурткі; у 30-я г. ў Нальчыку: ТРАМ, т-р-студыя, Рус. драм. т-р, каб. і балк. вандроўныя калг.-саўг. т-ры. У 1940 арганізаваны Каб. і Балк. драм. т-ры. З 1948 працуе Каб.-Балк. аб'яднаны драм. т-р (каб., балк. і рус. трупы; з 1961 т-ру прысвоена імя Шагенцукава). У 1968 адкрыўся Каб.-Балк. муз. т-р. Сярод тэатр. дзеячаў (1971): нар. артысты РСФСР К. Дышэкава і М. Сонаў, нар. артысты Каб.-Балк. АССР М. Болаў, Х. Кумахава, М. Кучукаў, Б. Сібекава.

Балкарскі лямцавы дыван з аплікацыйным узорам. 20 ст.



Літ.: История Кабардино-Балкарской АССР с древнейших времен до наших дней, т. 1—2, М., 1967; Кумыков Т. Х. Экономическое и культурное развитие Кабарды и Балкарии в XIX в., Нальчик, 1965; Гугов Р. Х. и Улигов У. А. Очерки революционного движения в Кабардино-Балкарии, Нальчик, 1967; Очерки истории кабардинской литературы, Нальчик, 1968; Писатели Кабардино-Балкарии (Биобиблиогр. указатель), Нальчик, 1965; Шлыков В. А. Изобразительное искусство Кабардино-Балкарии, Нальчик, 1963; Горчаков В. А. Художники Кабардино-Балкарии, Л., 1964; Чеченов И. М. Древности Кабардино-Балкарии, Нальчик, 1969; Шортанов А. Т. Театральное искусство Кабардино-Балкарии, Нальчик, 1961. *В. С. Шапліка* (прырода, нар. гасп.). Мінск; *Г. Х. Мамбетаў* (гістар. нарыс), *А. Васчотны* (культура). Нальчык.

КАБАРДЗІНА-БАЛКАРСКІ УНІВЕРСІТЭТ, вышэйшая навуч. ўстанова. Засн. ў 1957 у Нальчыку на базе Кабардзіна-Балкарскага пед. ін-та (з 1932 у Пяцігорску; у 1937 пераведзены ў Нальчык). Ф-ты ў 1971/72 навуч. г.: гісторыка-філал., фіз.-матэм., с.-г., хімічны, інж.-тэхн., медыцынскі. Навучанне дзённае, вячэрняе, завочнае. Есць аспірантура. Прымае да абароны канд. і докт. дысертацыі.

КАБАРДЗІНА-ЧЭРКЕСКАЯ МОВА, адна з абхаза-адыгскай групы *іберыйска-каўказскіх моў*. Пашырана ў Кабардзіна-Балкарскай АССР і Карачаева-Чэркескай а. в. На ёй гаворыць каля 250 тыс. чал. Пісьменнасць з 1924 на аснове лац., з 1936 рус. алфавіта.

У К.-ч. м. вылучаюць дыялекты: вялікай Кабарды (аснова літ. мовы), маздокскі, бесленееўскі і кубанскі. Асаблівасці К.-ч. м.: у фанетыцы — вялікая колькасць зычных і бедная сістэма галосных; у марфалогіі — простая сістэма імёнаў, дзеяслоў мае катэгорыі асобы, ліку, часу і інш.; у сінтаксісе — наяўнасць аргатыўнай канструкцыі.

Літ.: Языки народов СССР, т. 4, М., 1967.

КАБАРДЗІНСКАЯ парода коней, горная верхавая парода, выведзеная ў пач. 16 ст. на Паўн. Каўказе скрыжаваннем мясцовых парод з карабахскай, туркм., араб., нагайскайародамі. На Беларусь коней гэтай пароды пачалі завозіць у 1944, выкарыст. ў спорце.

Вынослівыя коні сухой канстытуцыі. Масць пераважна гнядая, цёмна-гнядая і вараная. Вылучаюць 3 тыпы: усходні, асноўны і густы. Найлепшы вынік розвасці — 1600 *м* за 1 *мін* 53,4 *сек*. Найб. каштоўныя коні густога тыпу. Сярэднія прамеры жарабцоў (*см*): выш. ў карку 153, абхват грудзей 176, пясці 19,4; кабыл адпаведна: 149; 177; 18,4. Жывая маса 470—500 *кг*.

Літ.: Кабардинская порода лошадей, у кн.: Книга о лошади, т. 1, М., 1952; Государственная племенная книга лошадей кабардинской породы, т. 4, М., 1964. *У. К. Гладэнка*. Жодзіна.

КАБАТ (станік, кітлік, шнуроўка), жаночая безрукаўка, частка беларускага народнага гарнітура. Кроем і формаю падобна на *гарсэт*. У прадстаўніц знаці 16—18 ст. К. называлася плечавое адзенне з рукавамі.

КАБАТАЖ (франц. cabotage), суднаходства паміж портамі адной і той жа дзяржавы.

Адрозніваюць малы К. (суднаходства ў межах аднаго мора) і вялікі К. (паміж портамі розных мораў). У СССР кабатажнае плаванне рэгулюецца Кодэксам гандл. мараплаўства (артыкулы 71—72).

КАБАТНІКАВА Вера Рафаілаўна (н. 2.6.1924, Чыта), руская савецкая актрыса. Засл. арт. БССР (1959). Скончыла Ленінградскі тэатр. ін-т імя Астроўскага (1948). Працавала ў т-рах Новасібірска, Выбарга, Куйбышава. З 1953 у Магілёўскім драм. т-ры. Выканаўца роляў гераінь. Лепшыя ролі: Шура Азарава («Даўным-даўно» А. Гладкова), Соф'я («Гора ад розуму» А. Грыбаедава), Таня («Таня» А. Арбузава), Маша Забеліна («Крамлёўскія куранты» М. Пагодзіна), Эліза («Пігмаліён» Б. Шоў), Катарына («Утаймаванне свавольніцы» У. Шэкспіра), Алена Андрэеўна («Дзядзька Ваня» А. Чэхава), Валькірыя («Галоўная стаўка» К. Губарэвіча), Ніна («Усяго адно жыццё» А. Маўзона).

КАБАЦ (Kabatc) Эўгеніюш (н. 11.1.1930, Ваўкавыск), польскі пісьменнік. Друкуецца з 1950. Аўтар зб. апавяд. «П'яны анёл» (1957), «Аранне мора» (1965), аповесцяў «Прыгода з Агнешкай» (1962), «Адзінаццатая запаведзь» (1965), «Адпачынак у высокай траве» (1968). Пераклаў на польскую мову «Трэцюю ракету» В. Быкава і «Людзі на балоце» І. Мележа.

Тв.: Бел. пер.— у час. «Беларусь», 1965, № 5; «Полымя», 1969, № 7.

КАБАЧКІ (Cucurbita pepo var giraum ontia), аднагадовая расліна сям. гарбузовых, разнавіднасць гарбуза. Плады прадаўгаватыя, цыліндрычныя, рабрыстыя або гладкія; ядомыя, добры корм жывёле.



Кабачкі Грыбаўскія 37.

Радзіма К.— Мексіка. Вырошчваюцца амаль усюды, за выключэннем Крайняй Поўначы. Скараспелыя (выспяваюць праз 55—65 дзён пасля пагўлення ўсходаў). Растуць у адкрытым і ахоўным грунце. На Беларусі найб. пашыраны ў Брэсцкай, Гомельскай, Мінскай абл. Ураджай 300—500 *ц/га*. Сарты К.: Грэчаскія 110, Грыбаўскія 37.

Літ.: Юрина О. В. Селекция и семеноводство тыквенных культур, М., 1966; Трафімава Т. Г. Гарбузы, кабачкі і патысоны, Мн., 1954.

Л. Р. Няфёдава. Самахвалавічы, Мінскі р-н.

КАБА́ЧНІК Марцін Іаравлевіч [н. 27.8(9.9). 1908, Екацярынбург], савецкі хімік-арганік. Акад. АН СССР (1958, чл.-кар. 1953). Чл. КПСС з 1957. Скончыў Маскоўскі хіміка-тэхнал. ін-т (1931). Працуе ў Ін-це элементаарган. злучэнняў АН СССР, нам. дырэктара, заг. лабараторыі фосфарарган. злучэнняў (з 1954). Асн. навук. працы па хіміі фосфарарган. злучэнняў, іх сінтэзе, па таўтамерыі арган. рэчываў. Дзярж. прэмія СССР 1946. Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі.



Літ.: Мартин Израилевич Кабачник, М., 1967 (Материалы к биобиблиографии ученых СССР).

КАБА́ШНІКАЎ Канстанцін Паўлавіч (н. 24.7.1927, Гомель), беларускі савецкі фальклярыст. Д-р філал. н. (1971). Чл. КПСС з 1952. Скончыў Гомельскі пед. ін-т (1951). З 1957 супрацоўнік Ін-та мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Аўтар даследа-

ванняў пра бел. казкі, рабочы фальклор, рэвалюц. паэзію. Сааўтар прац «Беларуская народная вуснапаэтычная творчасць» (1967), «Праблемы сучаснага беларускага фальклору» (1969), «Беларускі эпас» (1959), «Беларускі фальклор Вялікай Айчыннай вайны» (1961). Складальнік зб. «Казкі і легенды роднага краю» (1960), «Беларускія народныя песні. Са зборнікаў П. В. Шэйна» (1962), «Казкі пра жывёл і чарадзейныя казкі» (1971) і інш.

Тв.: Нарысы па беларускаму фальклору, Мн., 1963; Беларуская казка ў казачным эпасе славян, Мн., 1968; Ад традыцыйнага фальклору да рэвалюцыйнай паэзіі, Мн., 1969.

Літ.: Бандарчык В. К. Даследаванне, прысвечанае развіццю беларускага фальклору эпохі капіталізму, «Весці АН БССР. Сер. грамадскіх навук», 1969, № 4.

КАБАЯСІ ТАКІДЗІ (26.8.1903, Пн Японіі — 20.2.1933), японскі пісьменнік. Чл. КПЯ з 1931. З беднай сялянскай сям'і. У 1931 выбраны сакратаром Саюза пралет. пісьменнікаў Японіі. Літ. дзейнасць пачаў у 1924. У аповесцях «Снегаахоўны гай» (1928, апубл. 1947—48), «15 сакавіка 1928 года» (1928), «Арганізатар» (1931), «Жыццё для партыі» (1933) і інш. рэалістычна паказаў цяжкае жыццё сялян і рабочых, капіталіст. эксплуатацыю, рост класавай самасвядомасці пралетарыяту, мужную барацьбу камуністаў за інтарэсы працоўных. Закатаваны японскай паліцыяй.

Тв.: Бел. пер.— у кн.: Альманах японскай пралетарскай літаратуры, Мн., 1933; рус. пер.— Избранное, М., 1957.

КА́БЕЛЬ (галанд. kabel канат, трос), адзін ці некалькі скручаных ізаляваных правадоў (жылаў), укрытых ахоўнай абалонкай. Бываюць сілавыя К. (моцнатокавыя), якія выкарыстоўваюцца для перадачы эл. энергіі; К. сувязі — у тэлефаніі, радыёвяшчанні, тэлебачанні і К. кантрольны — для сігналізацыі, дыстанцыйнага кіравання і вымярэння. Пракладваюцца ў зямлі спец. машынамі, у вадзе з дапамогаю суднаў.



Рыс. 1. Трохжыльны кабель напружаннем 10 *кв*: *1* — медныя токаправодныя жылы; *2* — папяровая ізаляцыя; *3* — запаўняльнікі з папяровага жгута; *4* — слой паясной ізаляцыі з папяровых стужак; *5* — свінцовая абалонка, якая засцерагае ізаляцыю кабелю ад уздзеяння паветра і вільгаці; *6* — папяровая стужка; *7* — праасфальтаваны джут; *8* — браня з стальных стужак; *9* — вонкавае пакрыццё з кабельнай пражы, насычанай нафтабітумам.

Сілавы К. напружаннем да 10 *кв* (гл. рыс. 1) мае папяровую ізаляцыю. У К. напружаннем 20—35 *кв* кожная жыла дадаткова ізалявана паперай, насычанай вязкім саставам. У К. напружаннем больш за 35 *кв* аб'ём ізаляванага слоя запаўняецца мінер. маслам пад ціскам. К. нізкага і сярэдняга ціску маюць канал для масла ў цэнтры меднай жылы (гл. рыс. 2). У К. высокага ціску ўсе жылы змяшчаюцца ў стальной трубе, напоўненай маслам. Газанапоўненыя К. бываюць нізкага, сярэдняга і высокага ціску, пракладваюцца ў стальной трубе, куды ўводзіцца газ (азот і інш.) пад ціскам. К. сувязі падзяляюцца на К. нізкай (гукавой) і высокай частот. Асн. характарыстыка — шырыня спектра частот. Мнагажыльныя К. сувязі складаюцца з вялікай колькасці ізаляваных медных дратоў. К. высокачастотныя бываюць сіметрычныя, у якіх два правады ствараюць сіметрычнае вонкавае эл.-магн. поле; кааксіяльныя, дзе адзін провад размешчаны ўнутры другога цыліндрычнага провада. Ізаляцыя паміж правадоў бывае суцэльная ці з спіралі або шайбаў, якія надзяюцца на ўнутр. провад. У кааксіяльных К. вонкавага эл.-магн. поля няма, уся энергія распаўсюджваецца ўнутры К., таму яны шырока выкарыстоўваюцца ў высокачастотнай радыётэхн. апаратуры, тэлебачанні, сістэмах шматканальнай далёкай сувязі і інш. Камбінаваны К.— спалучэнне сіметрычнага і кааксіяльнага (гл. рыс. 3). К. кантрольны складаецца з вялікай колькасці аднадротавых медных жылаў, ізаляваных пластмасаю, гумаю ці насычанай папяровай стужкаю. Асн. характарыстыка — павышаная мех. трываласць. Злучаюцца К. з дапамогаю кабельнай арматуры: канцавых муфтаў, заціскачак, наканечнікаў і інш. дэталяў, якія забяспечваюць надзейнае эл. і мех. злучэнне токаправодных жылаў. У БССР К. вырабляецца на з-дах «Гомелькабель» і «Мазыркабель».



Рыс. 2. Аднажыльны масланапоўнены кабель напружаннем да 220 *кв*: *1* — канал для масла; *2* — медная жыла; *3* — ахоўныя пакрыцці.



Рыс. 3. Папярочны разрэз камбінаванага кабелю сувязі: *1* — кааксіяльныя пары; *2, 3* — сіметрычныя чацвёркі; *4* — экранаваныя пары для радыётрансляцыі; *5* — свінцовая абалонка; *6* — вонкавыя ахоўныя пакрыцці.

Літ.: Бронгулеева М. Н. и Городецкий С. С. Кабельные линии высокого напряжения, М.— Л., 1963; Гроднев И. И. Кабели связи и перспективы их развития, М., 1968; Гроднев И. И. и Фролов П. А. Коаксиальные кабели связи, М., 1970. *Р. Я. Паспелаў.* Мінск.

КАБЗА́Р, украінскі народны спявак, які пад акампанемент бандуры (раней — кобзы) выконвае думы, гістар. і інш. песні.

К. ўдзельнічалі ў казацкіх вайск. паходах, праслаўлялі герояў нар. барацьбы з іншаземнымі захопнікамі. Выяўлялі надзеі і сац. мары прац. народа, найперш сялян, заклікалі да барацьбы з прыгнятальнікамі. Мастацтва К. расквітнела ў час барацьбы ўкр. народа за нац. незалежнасць (16—17 ст.). Вядомыя К. 19—20 ст. А. Шут, А. Верасай, І. Крукоўскі, Ф. Халодны, І. і М. Краўчанкі і інш. Сав. К. складаюць творы пра сацыяліст. Радзіму, дружбу народаў. К. данеслі да нашых дзён узоры класічнай нар. эпічнай паэзіі. Пра К. напісаны адзін з найлепшых вершаў К. Каганца «Кабзар».

КАБЗАРЭ́ЎСКІ Павел Сямёнавіч [сапр. Гардон Фавій Залманавіч; 1(14).8.1909, Магілёў — 8.10.1970], рускі савецкі пісьменнік-перакладчык. З сям'і службоўца. З 1925 у Ленінградзе. Удзельнік Айч. вайны. Пераклаў паасобныя творы Я. Купалы, Я. Коласа, К. Крапівы, М. Танка, П. Панчанкі, А. Звонака, І. Мележа, І. Шамякіна, Я. Скрыгана, Т. Хадкевіча, М. Ткачова, раманы «Сустрэнемся на барыкадах» (1956) П. Пестрака, «Праз гады» (1960) П. Галавача, «Світанне» (1961) А. Чарнышэвіча, «Вогненны азімут» (1967) А. Асіпенкі. Склаў шэраг зб. і анталогій бел. л-ры. Узнаг. ордэнам Чырв. Зоркі, медалямі.

Тв.: Говорят мои друзья, Мн., 1971.

П. П. Юрэвіч. Ленінград.

КАБІШЧА́НКА, рака, правы прыток р. Лужаснянкі (бас. Зах. Дзвіны). У верхнім цячэнні наз. Пальмінка. Даўж. 28 *км*. Цячэ ў Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл. Вадазбор (166 *км*²) у межах паўд. схілаў Гарадоцкага ўзв., значна аблесены і забалочаны. Самы большы прыток р. Нырка (левы). Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 1,3 *м³/сек*.

КАБО́Л, алгарытмічная мова, з дапамогай якой ажыццяўляецца праграмаванне для ЭВМ. Гл. *Мовы праграмавання*.

КАБУЛ, сталіца Афганістана і адм. ц. правінцыі Кабул. Размешчаны на р. Кабул, на выш. 1800 *м*. Вузел шашэйных і караванных шляхоў, аэрапорт. Гандл.-прамысл. і культ. цэнтр. 480 тыс. ж. (1969). Тэкст., запалкавая, мэблевая, шкляная, трыкатажная ф-кі, ф-кі фарфоравых вырабаў, па апрацоўцы каменю і дрэва; гарбарны, цэментавы, асфальтабетонны, мылаварны і маслабойны з-ды; хлебакамбінат, буд. камбінат (пабудаваныя з дапамогаю СССР), элеватар, ваен.-мех. з-д. Прадпрыемствы палігр. прамысловасці. Саматужныя маст. промыслы (сярэбраныя і залатыя ўпрыгожанні, вырабы з жалеза, медзі, выраб баваўняных тканін, дываноў, посуду). Афганская гістар.-філал. акадэмія, ун-т (1932), політэхн. ін-т, пабудаваны з дапамогаю СССР, Кабульскі музей (засн. ў 1918).

Дата заснавання горада невядома. Араб. і санскр. хронікі адносяць яе да 1 ці 2 ст. У 16—17 ст. уваходзіў у імперыю Вялікіх Маголаў. У 1738 падпаў пад уладу перс. правіцеля Надзір-шаха Афшара. З 1747 у складзе афг. дзяржавы, створанай *Ахмад-шахам Дурані*. Пры Цімур-шаху [1773—93] сталіца Афганістана. Пасля распаду Дуранійскай дзяржавы (1818) — цэнтр феад. княства, якому належала вял. роля ў аб'яднанні краіны. У 1-ю (1838—42) і 2-ю (1878—80) англа-афг. войны акупаваны англічанамі і разбураны.

На правым беразе р. Кабул — Стары горад з глінабітнай і фахверкавай забудовай. На ўзгорку цытадэль Бала-Хісар (сцены з 5 ст.). На левым беразе — Шахры-Нау (Новы горад) з каралеўскай рэзідэнцыяй, ун-там, адм. будынкамі. Помнікі: Калона Незалежнасці (1919), Калона Вызвалення (1929) і інш. За горадам у парку Багі-Бабур мячэць Шах-Джахана (1640).

КА́БУШКІН Іван Канстанцінавіч [Жан, Бабушкін, Сашка, Назараў; 2(15).2.1915, в. Малахоўцы Навагрудскага пав. Мінскай губ.— 1943], Герой Сав. Саюза (1965). З сялян. У Чырв. Арміі з 1935. Удзельнік сав.-фінляндскай вайны 1939—40. Увосень 1941 уключыўся ў барацьбу з ням.-фаш. захопнікамі ў Мінску. На чале невялікай баявой групы рабіў налёты на варожыя аўтамашыны. У кастр.— ліст. 1941 група знішчыла 8 ням. аўтамашын; па заданні Мінскага падпольнага к-та КП(б)Б і камандавання партыз. атрадаў і брыгад выконваў у Мінску разведвальныя і дыверсійныя аперацыі. У маі 1942 узначаліў аператыўную групу Мінскага падпольнага к-та КП(б)Б. Удзельнік выдання і распаўсюджвання падпольнай камуніст. л-ры. 4.2.1943 схоплены ням.-фаш. акупантамі на явачнай кватэры ў Мінску. Загінуў у фаш. катавальнях. Яго імем названа вуліца ў Мінску. Гл. таксама *Мінскае камуністычнае падполле*.



Літ.: Дорога в бессмертие, Мн., 1967, с. 56—81; Люди легенд, в 4, М., 1971, с. 134—145.

КАБЫЛЯ́НСКАЯ Вольга Юльянаўна (27.11.1863, мяст. Гура-Гумора Кімпалунгскай акр. на Букавіне — 21.3.1942), украінская пісьменніца. Дачка дробнага чыноўніка. Пасля 4-класнай ням. школы займалася самаадукацыяй. Раннія творы на ням. мове на тэму эмансіпацыі жанчын. У творах на ўкр. мове выкрывала мяшчанства, прыстасавальніцтва бурж. інтэлігенцыі, узнімала пытанне пра чалавечую годнасць (аповесці «Чалавек», 1894; «Царэўна», 1896; «У нядзелю рана зелле капала», 1908; апавяд. «Ён і Яна», 1895; і інш.). У сац.-псіхал. аповесці «Зямля» (1901, выд. 1902) раскрыла сац. прычыны збяднення сялян, вясковай цямноты. Імперыял. вайну выкрывала ў апавяд. «Ліст засуджанага салдата да свае жонкі», «Юда», «Насустрач долі», «Сніцца» (1917), «Звар'яцеў» (1927). Аддаючы ў паасобных творах даніну мадэрнізму, выступала пераважна як рэаліст. Па-мастацку адлюстравала цяжкае жыццё сялян і перадавых інтэлігентаў Букавіны, іх барацьбу за сац. і нац. вызваленне з-пад аўстра-венг., а пасля рум. манархічнага рэжыму. Творы К. перакл. на многія мовы народаў СССР і за мяжою.

Тв.: Твори, т. 1—5, Київ, 1962—63; рус. пер.— Избранное, М., 1953.

Літ.: Бабишкін О. Ольга Кобилянська, Львів, 1963; Томашук Н. О. Ольга Кобилянська, Київ, 1969; Ольга Кобилянська. Бібліогр. покажчик, Київ, 1960. *В. А. Чабаненка.* Запарожжа.

КАБЯКО́Ў Іван Рыгоравіч [н. 8(21).1.1917, с. Красная Слабада Трубчэўскага пав. Арлоўскай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1943. У Чырв. Арміі з 1939. Вызначыўся ў Магілёўскай вобл. Мотастралковы батальён на чале з маёрам К. прарваў варожую абарону каля Парычаў; у ноч на 28.6.1944 вызваліў чыг. ст. Бабруйск; 29—30 чэрв. перашкодзіў адступленню ворага па Мінскай шашы; 2.7.1944 захапіў мост цераз Свіслач каля Мар'інай Горкі і гэтым забяспечыў пераправу танкаў брыгады. Жыве ў Казані.

КА́ВА, кававае дрэва (Coffea), род вечназялёных дрэў і кустоў сям. марэнавых. Вядома каля 50 відаў, пашыраных



Кава аравійская: *1* — галінка з кветкамі і пладамі; *2* — кветка; *3* — плод з насеннем.

у тропіках. Найб. значэнне маюць К. аравійская (C. arabica) і К. ліберыйская (C. liberica), якія культывуюцца як харчовыя расліны ў трапічных краінах Амерыкі (асабліва ў Бразіліі і Калумбіі), Афрыкі, Азіі і Аўстраліі. У СССР вырошчваецца ў аранжарэях і пакоях.

Дрэвы выш. да 12 м. Лісце цэласнае, скурастае. Кветкі двухполыя белыя, духмяныя, сабраныя па 3—7 у пазухах лісця. Плады касцянкападобныя, чырвоныя або чорна-сінія, у кожным па 2 зерні, якія маюць кафеін, цукры, тлусты алей, бялковыя і дубільныя рэчывы. З пладоў гатуюць напітак — каву. З сырога зерня атрымліваюць *кафеін*.

Літ.: Жуковский П. М. Культурные растения и их сородичи, 3 изд., Л., 1971.

КАВАЛГІН Вадзім Міхайлавіч (н. 19.2.1919, Смаленск), бел. сав. філосаф і псіхолаг. Д-р філас. н. (1965), праф. (1965). Чл. КПСС з 1945. Удзельнік Айч. вайны. Скончыў Смаленскі пед. ін-т (1949), Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС (1952). У 1952—63 старшы навук. супрацоўнік Ін-та філасофіі і права АН БССР. З 1964 заг. кафедры псіхалогіі Мінскага пед. ін-та імя М. Горкага. Старшыня Беларускага аддзялення т-ва псіхолагаў СССР (з 1965). Аўтар прац па праблемах псіхалогіі, матэрыялістычнай дыялектыкі, філасофскіх пытаннях прыродазнаўства, атэізму. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

Тв.: Вучэнне І. П. Паўлава — выдатны ўклад у прыродазнаўчанавуковую аснову дыялектычнага матэрыялізму, Мн., 1953; Навука і рэлігія аб псіхіцы чалавека, Мн., 1958; Диалектический материализм о законах науки, Мн., 1958; Проблема ощущений и рефлекторная теория, Мн., 1959; (разам з Г. Ф. Аляксандравым і У. І. Горбачам) Развитие В. И. Лениным марксистского учения о законах диалектики, Мн., 1960; Марксистская философия против идеализма и метафизики, Мн., 1961; Рефлекторная теория ощущений, Мн., 1963; Раскрывая тайны психики, Мн., 1968.

КАВАЛЕНКА Анатоль Якаўлевіч (н. 23.1.1919, в. Якімаўка Рэчыцкага пав. Мінскай губ.), Герой Сав. Саюза (1945). З сялян. Чл. КПСС з 1944. Скончыў ваен.-авіяц. вучылішча (1940), Адэскі пед. ін-т (1951). У Чырв. Арміі з 1939. У Айч. вайну на Зах., Паўн.-Каўказскім, Закаўказскім, Ленінградскім, 3-м Прыбалт. і 1-м Бел. франтах — лётчык разведвальнага авіяцыйнага палка. Сфатаграфаваў 900 чыгуначных эшалонаў ворага, выявіў 23 аэрадромы, 15 абарончых рубяжоў, 50 пераправ, у паветраных баях збіў 7 самалётаў, 16 знішчыў на зямлі. Жыве ў Херсоне.



КАВАЛЕНКА Барыс Яўгенавіч [н. 2(15).5.1917, г. Екацярынадар Кубанскай вобл.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1944. На фронце з 1941. Вызначыўся ў лютым 1944 у Магілёўскай вобл. Батальён маёра К. скрытна пераправіўся цераз Дняпро, зайшоў у тыл ворагу, наладзіў сувязь з беларускімі партызанамі і ўдарам з тылу разбіў нямецкі гарнізон, вызваліў ст. Тошчыца. Вывеў у савецкі тыл каля 7 тыс. мірных жыхароў. Жыве ў Свярдлоўску.

КАВАЛЕНКА Віктар Антонавіч (н. 21.7.1929, в. Сакаўшчына Валожынскага пав. Навагрудскага ваяводства), бел. сав. крытык і літаратуразнавец. Канд. філал. н. (1959). З сялян. Скончыў Мінскі пед. ін-т (1953). У 1948—49 і ў 1953—55 настаўнік. З 1958 навук. супрацоўнік Ін-та л-ры АН БССР. Друкуецца з 1952. Даследуе праблемы сучаснай л-ры. Адзін з аўтараў «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры» (т. 1, 1965), «Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры» (т. 2, 1969).

Тв.: Пошукі і здзяйсненні, Мн., 1963; Давер, Мн., 1967; Голас чалавечнасці, Мн., 1970.

КАВАЛЕНКА Кірыла Аляксеевіч [н. 19(31).3.1891, мяст. Багушэвічы Ігуменскага пав. Мінскай губ.], генерал-лейтэнант (1946). З сялян. Чл. КПСС з 1942. Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1934). У арміі з 1914, у Чырв. Арміі з 1920. Удзельнік грамадз. вайны на Зах. фронце, ваяваў пад Лідай, Маладзечнам. У 1931—41 у інспекцыі пяхоты РСЧА. У Айч. вайну камандзір дывізіі на Зах. фронце, нам. нач. і нач. Гал. ўпраўлення фарміравання і камплектавання войск Чырв. Арміі, нам. камандуючага войск Сталінградскага і Данскога франтоў. У 1942—47 нач. упраўлення Народнага камісарыята абароны (з 1946 Міністэрства абароны). З 1947 у адстаўцы. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 4 інш. ордэнамі, медалямі. Жыве ў Маскве.



КАВАЛЕНКА Павел Васілевіч (1916, Петрапаўлаўск — 24.8.1949), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1943. У Чырв. Арміі з 1941. Вызначыўся ў Магілёўскай вобл. У снеж. 1943 узвод мінамётчыкаў на чале з лейтэнантам К. знішчыў скопішча варожых сіл, падрыхтаваных да атакі каля в. Скварск Чавускага р-на. 23.6.1944 агнём мінамётаў зрабіў 2 праходы ў драцяных загародах варожай абароны на р. Проня, знішчыў 3 кулямётныя кропкі.

КАВАЛЕНКА Пётр Іванавіч [1(14).10.1909, пас. Перасечная Харкаўскай губ.— 19.11.1943], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1942. У Чырв. Арміі з 1935, на фронце з 1941. Вызначыўся ў Камарынскім р-не Палескай вобл. У вер. 1943 пад агнём ворага камандзір асобнага сапёрнага батальёна падпалкоўнік К. арганізаваў хуткую пераправу часцей дывізіі цераз Дняпро. Загінуў у баі.

КАВАЛЕНКА Сяргей Апісімавіч (27.11.1921, в. Ульянавічы Сенненскага пав. Віцебскай губ.— 1.2.1945), Герой Сав. Саюза (1945). У Сав. Арміі з 1944. Вызначыўся 1.2.1945 у баях каля г. Шургаст (Германія). Роце, у якой служыў К., у час наступлення шлях пераграбыў кулямётны агонь з варожага дзота. 7 салдатаў павінны былі знішчыць агнявую кропку, з іх жывы астаўся адзін К. Калі скончыліся боепрыпасы, ён закрыў амбразуру дзота сваім целам. Рота падняласяў атаку і прарвала варожую абарону.



КАВАЛЕНТНАЯ СУВЯЗЬ, гл. ў арт. *Хімічная сувязь*.

КАВАЛЕНЯ Аляксандр Дзмітрыевіч [21.2(5.3).1895, в. Кашніцы Гродзенскага пав.— 27.8.1937], бел. сав. археолаг. З сялян. Скончыў Свіслацкую настаўніцкую семінарыю (1915) і БДУ (1929). Удзельнік грамадз. вайны. З 1932 навук. супрацоўнік секцыі археалогіі АН БССР. Даследаваў стаянкі Бердыж, Юравічы, Банцараўшчыну, археал. помнікі Тураўшчыны, збіраў матэрыялы для археал. карты Беларусі, сістэматычна вывучаў культуры плямёнаў, што жылі ў басейне Дняпра, на левабярэжных прытоках Прыпяці і Заходняй Дзвіны.



Тв.: Археалагічныя разведкі ў Магілёўскай, Брэсцкай і Мінскай акругах, у кн.: Працы археалагічнай камісіі БАН, т. 2, Мн., 1930; (разам з С. С. Шутавым) Матэрыялы з дагісторыі Тураўшчыны, там жа; Археалагічныя росшукі ў вярхоўях рэк Друці, Усяж-Бук і Лукомкі, у кн.: Працы секцыі археалогіі БАН, т. 3, Мн., 1932.

Т. М. Каробушкіна. Мінск.

КАВАЛЕРЫЯ (італьян. cavalleria), конніца, род сухапутных войск. Узнікла ў стараж. рабаўладальніцкіх краінах. На Русі пры Іване IV нерэгулярная К. была асн. родам войск. Шматлікім разрадам К. з'яўляліся казацкія войскі. Рэгулярную К. ў Расіі заснаваў Пётр I адначасова з рэгулярнай рус. арміяй. Да пач. 1-й сусв. вайны К. была адзіным хуткім родам войск. Сав. К. створана ў грамадз. вайну: конны корпус С. М. Будзённага, 3-і конны корпус Г. Дз. Гая, асобная кав. брыгада Р. І. Катоўскага, корпус чырв. казацтва В. М. Прымакова, пазней 1-я і 2-я конныя арміі. У Вял. Айч. вайну сав. кав. часці ўдзельнічалі ў многіх вял. аперацыях. У 1941 вызначылася кав. група Л. М. Даватара, якая зрабіла глыбокі рэйд у тыл ням.-фаш. войск, што наступалі на Маскву, у 1942 — кав. злучэнне П. А. Бялова і інш. За высокае баявое майстэрства, мужнасць і адвагу большасці кав. злучэнняў прысвоены званні гвардзейскіх і ганаровыя найменні. З матарызацыяй і механізацыяй войск баявое выкарыстанне К. ў арміях большасці краін спынілася.

Літ.: Энгельс Ф. Избранные военные произведения, М., 1958, с. 205—232; Тюленев И. В. Советская кавалерия в боях за Родину, М., 1957; Буденный С. М. Пройденный путь, кн. 1—2, М., 1959—65.

КАВАЛЕЎСКАЯ (дзявочае Карвін-Крукоўская) Софія Васілеўна [3(15).1.1850, Масква — 29.1(10.2).1891], рускі матэматык, пісьменніца і публіцыстка, першая ў свеце жанчына-прафесар. Чл.-кар. Пецярбургскай АН (1889). Не маючы магчымасці займацца навукай у Расіі (жанчыны ў расійскія ун-ты ў той час не мелі доступу), выехала за мяжу, дзе вывучала матэматыку. З 1884 праф. матэматыкі Стакгольмскага ун-та. Асн. працы ў галіне матэм. аналізу (дыферэнцыяльныя ўраўненні і аналіт. функцыі), механікі (даследаванне вярчэння цвёрдага цела вакол нерухомага пункта) і астраноміі (пра форму кольцаў Сатурна).



Тв.: Научные работы, М., 1948 (бібліягр.); Воспоминания и письма, М., 1961.

Літ.: Полубаринова-Кочина П. Я. Софья Васильевна Ковалевская. Ее жизнь и деятельность, М., 1955; История отечественной математики, т. 2, Киев, 1967.

КАВАЛЕЎСКІ Аляксандр Ануфрыевіч [7(19).11.1840, с. Шусцянцы Дынабургскага пав. Віцебскай губ.— 9(22).11.1901], рускі біёлаг-эвалюцыяніст, адзін з заснавальнікаў параўнальнай эмбрыялогіі і фізіялогіі беспазваночных жывёл, эксперыментальнай і эвалюцыйнай гісталогіі. Акад. Пецярбургскай АН (1890). Брат У. А. *Кавалеўскага*. Скончыў Пецярбургскі ун-т (1863). Праф. Казанскага, Кіеўскага, Новарасійскага, Пецярбургскага ун-таў (1868—94). Асн. працы па анатоміі і гісторыі развіцця беспазваночных. Паказаў падабенства ў развіцці ўсіх многаклетачных жывёл, што з'явілася важным доказам адзінства арган. свету і яго развіцця. Высветліў месца некат. жывёл (ланцэтніка, асцыдыі і інш.) у заалаг. сістэме. Апісаў зародкавыя лісткі ў насякомых, ігласкурых, грабневікоў. Даследаваў будову і функцыі выдзяляльнай сістэмы, фагацытарных органаў беспазваночных. Паслядоўны прыхільнік вучэння Ч. Дарвіна.



Тв.: Избранные работы, М., 1951 (бібліягр.).

Літ.: Догель В. А., А. О. Ковалевский, М.— Л., 1945 (бібліягр.); Хлопин Н. Г. и Кнорре А. Г., А. О. Ковалевский как гистолог и значение его работ для развития гистологии, «Успехи современной биологии», 1951, т. 32, в. 3 (бібліягр.).

КАВАЛЕЎСКІ Восіп Міхайлавіч [28.12.1800 (9.1.1801), Гродна — 20.10(1.11).1878], рускі вучоны, адзін з засн. манголазнаўства ў Расіі.

Чл.-кар. Пецярбургскай АН (1847). Скончыў Віленскі ун-т (1820). З 1833 праф., з 1855 рэктар Казанскага, з 1862 праф. Варшаўскага ун-таў. Падарожнічаў па Забайкаллі, Манголіі і Кітаі, вывучаў мову, л-ру, гісторыю і этнаграфію манголаў. Асн. працы: «Кароткая граматыка мангольскай кніжнай мовы» (1835), «Мангольская хрэстаматыя» (т. 1—2, 1836—37), «Мангольска-руска-французскі слоўнік» (т. 1—3, 1844—49), адзначаны Дэмідаўскай прэміяй Пецярбургскай АН.

Літ.: Kotwicz W. Józef Kowalewski - orientalista, Wrocław, 1948. *М. І. Каміноскі.* Мінск.

КАВАЛЕЎСКІ Георгій Ціханавіч (н. 15.4.1918, в. Мацюшына Сцяна Лепельскага пав. Віцебскай губ.), беларускі савецкі эканаміст. Канд. эканам. н. (1950). Чл. КПСС з 1940. Удзельнік Айч. вайны. Скончыў Віцебскі пед. ін-т (1940), Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС, адначасова Усесаюзны завочны фін. ін-т (1950). У 1950—52 заг. кафедры эканам. навук, нам. дырэктара Мінскай вышэйшай парт. школы. У 1952—64 дырэктар, з 1964 заг. сектара паліт. эканоміі Ін-та эканомікі АН БССР. Гал. кірунак навук. дзейнасці — заканамернасці таварна-грашовых і размеркавальных адносін сацыялізма. Дэп. Вярх. Савета БССР 4—5-га скл. Узнаг. ордэнам Чырв. Зоркі, медалямі.

Тв.: Пытанні аплаты працы ў калгасах, Мн., 1959; Теоретические основы социалистического ценообразования, у кн.: Ценообразование на предметы потребления, Мн., 1965; (разам з І. У. Барысевічам) Формирование валового дохода колхозов, Мн., 1968; у кн.— Категории и законы распределительных отношений социализма, Мн., 1968; Стоимость в условиях социализма, Мн., 1971.

КАВАЛЕЎСКІ Максім Максімавіч [27.8.1851, Харкаў — 23.3(5.4).1916], рускі сацыёлаг-пазітывіст, гісторык, правазнавец, паліт. дзеяч бурж.-ліберальнага кірунку. Акад. (1914). Праф. Маск. (1878—87) і Пецярбургскага (1905—16) ун-таў і шэрагу ун-таў Еўропы і Амерыкі (1887—1905). З 1905, вярнуўшыся ў Расію, заняў рэакц. паліт. пазіцыю, выступаў супраць рэвалюцыі, за мірнае правядзенне рэформаў пры захаванні асноў самадзярж. ладу. Дэпутат 1-й Дзярж. думы (1906), чл. Дзярж. савета (з 1907). Выдаваў час. «Вестник Европы» (з 1909). К. Маркс і Ф. Энгельс высока цанілі даследаванні К. ў галіне родавых адносін, звычаёвага права, гісторыі сялянскай абшчыны.

Тв.: Закон и обычай на Кавказе, т. 1—2, М., 1890; Происхождение современной демократии, т. 1—4, М., 1895—97; Экономический рост Европы до возникновения капиталистического хозяйства, т. 1—3, М., 1898—1903; Очерк происхождения и развития семьи и собственности, пер. с франц., М., 1939.

Літ.: Энгельс Ф. Паходжанне сям'і, прыватнай уласнасці і дзяржавы, Маркс К. і Энгельс Ф. Выбр. тв., т. 2, Мн., 1952; М. М. Ковалевский. Ученый, государственный и общественный деятель и гражданин. Сб. ст., П., 1917; Сафронов Б. Г., М. М. Ковалевский как социолог, М., 1960.

КАВАЛЕЎСКІ Уладзімір Апуфрыевіч [2(14).8.1842, с. Шусцяніцы Дынабургскага пав. Віцебскай губ.— 16(28).4.1883], рускі прыродазнавец, заснавальнік эвалюцыйнай палеанталогіі. Брат А. А. *Кавалеўскага* і муж С. В. *Кавалеўскай*. Большасць прац К. па праблемах палеанталогіі капытных жывёл. Змены ў будове капытных жывёл звязаў са зменамі ўмоў асяроддзя, напр. пераход ад мнагапальцавасці (у продка сучаснага каня) да аднапальцавасці (у сучаснага каня)—з прыстасаваннем да хуткага бегу, да жыцця на адкр. прасторах. Працы К. высока цаніў Ч. Дарвін. Перакл. на рус. мову шэраг работ Дарвіна.



Тв.: Собрание научных трудов, т. 1—2, М., 1950—56 (бібліягр.).

Літ.: Давиташвили Л. Ш., В. О. Ковалевский, 2 изд., М., 1951 (бібліягр.).

КАВАЛЁВА Марыя Іосіфаўна [н. 12(25).7.1905, в. Валатава Гомельскага пав. Магілёўскай губ.], перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1958). Чл. КПСС з 1952. З 1930 у калгасе «Чырвоны працаўнік» (з 1950 калгас імя Леніна) Гомельскага р-на: даярка, загадчыца малочнатаварнай фермы, старшыня калгаса, з 1953 загадчыца малочнатаварнай фермы.

КАВАЛЁВА Пелагея Нікандраўна [н. 26.3(8.4).1902, в. Заліп'е Гомельскага пав. Магілёўскай губ.], гасп. дзеяч, Герой Сац. Працы (1960). Чл. КПСС з 1940. У 1919—23 настаўніца пач. школы, у 1931—38 у калгасе імя М. Горкага Гомельскага р-на. У 1938—41, 1945—48 нам. старшыні Гомельскага райвыканкома; у 1950—52 другі сакратар Гомельскага РК КПБ. З 1952 да 1964 старшыня калгаса «За Радзіму» Гомельскага р-на. На XXI, XXII, XXIV з'ездах КПБ выбрана чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета БССР 5-га скл. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі. Жыве ў Гомелі.

КАВАЛЁНАК Міхаіл Іванавіч [27.10(9.11).1900, мяст. Багушэвічы Ігуменскага пав. Мінскай губ.— 12.1.1958], бел. сав. вучоны ў галіне тэрапіі, дзярж. дзеяч БССР. Засл. ўрач БССР (1941). Чл. КПСС з 1927. Скончыў БДУ (1928). Працаваў у тэрапеўт. клініцы Мінскага мед. ін-та (з 1937 дацэнт). Удзельнік Айч. вайны. Міністр аховы здароўя БССР (1940—48). Заг. кафедры прапедэўтыкі ўнутраных хвароб Мінскага мед. ін-та (1948—58). Працы па пытаннях этыялогіі, дыягностыкі і лячэнні халецыстытаў і піялітаў. Чл. ЦК КП(б)Б (1947). Дэпутат Вярх. Савета БССР 2-га скл. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі.

Тв.: Значение секреции желудка в этиологии, диагностике и терапии холециститов и пиелитов, Мн., 1938.

КАВАЛЁЎ Апанас Фёдаравіч [н. 2(15).12.1903, в. Лошніца Барысаўскага пав. Мінскай губ.], дзярж. дзеяч БССР. З сялян. Чл. КПСС з 1926. Скончыў Віцебскі каап. тэхнікум (1931) і вышэйшыя пед. курсы ў Ленінградзе (1932). З 1926 старшыня сельсавета і на каап. рабоце ў Барысаўскім р-не. З 1932 у Віцебску на пед. рабоце, з 1934 на парт. рабоце: інструктар гаркома партыі, сакратар парт. арг-цыі ф-кі «Сцяг індустрыялізацыі». З вер. 1937 старшыня СНК БССР. З ліп. 1938 старшыня арганіз. к-та Вярх. Савета БССР па стварэнні Мінскай вобл. Пасля на каап. рабоце ў Омскай вобл. і Малд. ССР. У 1947—60 нам. старшыні праўлення Белкаапсаюза. На XVII з'ездзе КП(б)Б выбраны чл. ЦК; чл. Бюро ЦК (31.1.—4.10.1938). Дэп. Вярх. Савета СССР 1-га скл. і Вярх. Савета БССР 1-га скл. Жыве ў Мінску.

КАВАЛЁЎ Дамітрый Міхайлавіч [н. 4(17).6.1915, мяст. Ветка Магілёўскай губ.], рускі савецкі паэт. Чл. КПСС з 1945. Сын кавалера. Скончыў Выш. літ. курсы пры Літаратурным ін-це імя М. Горкага (1957). Удзельнік Айч. вайны. Друкуецца з 1938. Першы зб. «Далёкія берагі» (Мн., 1947). Лірыцы паэта ўласцівыя высокі пафас грамадзянскасці, тонкае адчуванне псіхалогіі чалавека, роднай прыроды. Аўтар зб. «Ціхая маланка» (1961), «Маўчанне навальніц» (1964), паэмы «Пра хлопчыка Жэньку з сяла Ніжнія Дзеравенькі» (1955) і інш. Перакладчык твораў бел. пісьменнікаў.



Тв.: Стихи, Мн., 1950; Мы не расстаемся, Мн., 1953; Рябиновые ночи, Мн., 1958; Солдатские думы, М., 1958; Студеное солнце, М., 1961; Озимь, М., 1968; Тревожный мир, М., 1970; Годы, М., 1971; Зябь, М., 1971.

Літ.: Вялюгін А. Шчырае, свежае слова, «Полымя», 1947, № 7; Михайлов И. Родные просторы, «Нева», 1960, № 5; Ланщиков А. Чувство пути, «Октябрь», 1967, № 9.

КАВАЛЁЎ Іван Сідаравіч [н. 16(29).5.1913, г. Ярцава Смаленскай губ.], беларускі савецкі вучоны ў галіне радыётэхнікі. Чл.-кар. АН БССР (1969). Д-р тэхн. н., праф. (1966). Чл. КПСС з 1946. Удзельнік Айч. вайны. У 1941 скончыў Ленінградскі эл.-тэхн. ін-т імя Ульянава (Леніна). У 1947—1953 выкладчык, потым дацэнт гэтага ін-та. У 1953—56 нам. дырэктара Таганрогскага радыётэхн. ін-та. У 1956—62 рэктар Разанскага радыётэхн. ін-та. У 1962—64 заг. кафедры антэннафідэрных прыстасаванняў Бел. політэхн. ін-та. З 1964 рэктар і адначасова заг. кафедры антэн і прыстасаванняў звышвысокай частаты (ЗВЧ) Мінскага радыётэхн. ін-та. Навук. працы па радыётэхніцы і радыёэлектроніцы (антэнна-фідэрных прыстасаваннях, палоскавых хваляводах, прыладах ЗВЧ). Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.



Тв.: (Разам з М. Я. Вішнеўскім і М. П. Глухановым) Аппаратура высокого давления с экранированным электродвигателем, М.—Л., 1956; (з імі ж) Аппаратура высокого давления с герметическим приводом, 2 изд., М.— Л., 1960; Теория и расчет полосковых волноводов, Мн., 1967.

КАВАЛЁЎ Іосіф Несцеравіч [24.9(6.10).1893, в. Віркаў Бабруйскага пав. Мінскай губ.— 13.10.1969], генерал-лейтэнант войск сувязі (1942). З сялян. Чл. КПСС з 1926. Скончыў акадэм. курсы (1949). У арміі з 1914, у Чырв. Арміі з мая 1918. Удзельнік грамадз. вайны на Усх. фронце. З 1932 у Прыволжскай ваен. акрузе, з 1938 нач. сувязі Ленінградскай ваен. акругі. У Айч. вайну на Ленінградскім фронце — нач. войск сувязі фронту. У 1946—58 у ваен. акругах, нач. Вышэйшых акадэм. курсаў сувязі. З 1958 у запасе. Узнаг. ордэнам Леніна, 10 інш. ордэнамі, медалямі.



КАВАЛЁЎ Мікалай Кузьміч (жн. 1917, мяст. Жлобін Магілёўскай губ.— 17.3.1945), Герой Сав. Саюза (1945). З рабочых. Чл. КПСС з 1939. У Чырв. Арміі з 1938. У Айч. вайну ўдзельнічаў у абароне Масквы, у вызваленні Беларусі, Прыбалтыкі. Вызначыўся ў баях ва Усх. Прусіі. Полк на чале з гвардыі падпалкоўнікам К. у баі на подступах да в. Ленхефен Кёнігсбергскай правінцыі знішчыў многа жывой сілы ворага, 2 самаходныя гарматы, 20 кулямётаў, захапіў трафеі. Загінуў у баі.

КАВАЛЁЎ Мікалай Паўлавіч (н. 27.9.1921, в. Кавалі Бабруйскага пав. Мінскай губ.), перадавік прамысловасці, Герой Сац. Працы (1971). Чл. КПСС з 1944. Удзельнік Айч. вайны. З 1955 на Бабруйскім з-дзе гумавых тэхн. вырабаў, з 1960 каландражаты і брыгадзір каландра. Званне Героя Сац. Працы прысвоена за поспехі ў выкананні 8-га пяцігадовага плана. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, медалямі.

КАВАЛЁЎ Мікіта Рыгоравіч [н. 7(20).12.1909, в. Майскае Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ.], Герой Сав. Саюза (1944). З сялян. Чл. КПСС з 1932. Скончыў ваен. вучылішча (1937). У Чырв. Арміі з 1931. У Айч. вайну на Зах., Паўн.-Зах., Варонежскім, 1-м і 2-м Укр. франтах; на Забайкальскім фронце ўдзельнічаў у разгроме яп. Квантунскай арміі. Вы-



значыўся 6.11.1943 у баях за вызваленне Кіева. Танкавы батальён на чале з гвардыі маёрам К. адзін з першых уварваўся ў горад і, адбіваючы контратакі ворага ў Кіеве, Васількове і Белай Царкве, знішчыў 8 танкаў і самаходных гармат, 24 пушкі, 124 кулямёты, 26 аўтамашын. Жыве ў Мінску.

КАВАЛЁЎ Міхаіл Ільіч (н. 26.12.1918, в. Нова-Нікалаеўка Стэрлітамакскага пав. Уфімскай губ.), кіраўнік разведвальна-дыверсійных груп на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1948. Скончыў Маскоўскі пед. ін-т імя Лібкнехта (1941), ВПШ пры ЦК КПСС (1971). У жн. 1941 у складзе развед.-дыверсійнай групы ў Віцебскай вобл. У вер. 1941 узначаліў групу, наладзіў сувязь з камсамольцамі в. Сімакі Багушэўскага р-на. Групы на чале з К. дзейнічалі пад Мінскам, Віцебскам, Полацкам, Барысавам, Маладзечнам, Вілейкай, Смаргонню, перадавалі Чырв. Арміі звесткі разведкі, рабілі дыверсіі ў тыле ворага; правялі больш за 120 дыверсій у гарнізонах ворага, на чыгунках і дарогах. З 1947 на камсамольскай, парт. і дыпламат. рабоце. З 1958 у апараце ЦК КПСС. Узнаг. ордэнам Леніна, 5 інш. ордэнамі, медалямі.

Літ.: Климов И. и Граков Н. Партизаны Вилейщины, 2 изд., Мн., 1970; Пахомов Н. И., Дорофеенко Н. И. и Дорофеенко Н. В. Витебское подполье, Мн., 1969.

КАВАЛЁЎ Міхаіл Пракопавіч [25.6(7.7).1897, станіца Брухавецкая Екацярынадарскага пав. Кубанскай вобл.— 31.8.1967], генерал-палкоўнік (1943). З сялян. Чл. КПСС з 1927. Скончыў Ваен. акадэмію РСЧА (1924). У арміі з 1915, у Чырв. Арміі з 1918. У грамадз. вайну камандаваў сфарміраваным ім атрадам казакоў-добраахвотнікаў, пазней палком, брыгадай. Удзельнік баёў супраць белагвардзейцаў на Кубані, Цераку, пад Стаўрапалем, Астраханню, супраць бандаў Антонава на Тамбоўшчыне. У 1938—40 камандуючы войск БВА. У час вызвалення Зах. Беларусі ў вер. 1939 камандаваў войскамі Бел. фронту. Удзельнік сав.-фінляндскай вайны 1939—40. У Айч. вайну на Д. Усходзе, удзельнік вайны супраць імперыял. Японіі. У 1949—54 пам. камандуючага войск Ленінградскай ваен. акругі. На XVIII з'ездзе ВКП(б) выбраны канд. у чл. ЦК; на XVII з'ездзе КП(б)Б — чл. ЦК і Бюро ЦК КП(б)Б. Дэп. Вярх. Савета БССР 1-га скл. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, 6 інш. ордэнамі.

КАВАЛЁЎ Навум Гаўрылавіч [н. 2(14).12.1898, в. Вуглы Чавускага пав. Магілёўскай губ.], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Баранавіцкай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1919. Скончыў Вышэйшую тактычна-стралковую школу (1923). Удзельнік грамадз. вайны. З 1923 у Чырв. Арміі, з 1929 на сав. рабоце і ў органах НКУС. У партызанах з ліст. 1942 — кіраўнік дыверсійнай групы, камандзір атрада; з мая 1943 камандзір *партызанскай брыгады Першамайскай* Баранавіцкай вобл. Пасля вайны заг. аддзела Баранавіцкага абкома КП(б)Б, нам. старшыні аблвыканкома. У 1948—50 старшыня Клецкага райвыканкома. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.



КАВАЛЁЎ Павел Нічыпаравіч [н. 5(18).11.1912, в. Склімін Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ.], беларускі савецкі пісьменнік. Чл. КПСС з 1940. З сялян. Скончыў Камуніст. ін-т журналістыкі ў Мінску (1936). Працаваў у рэд. газ. «Звязда». У Айч. вайну — у Цэнтр. штабе партыз. руху, потым у ЦК КПБ. Сакратар праўлення СП БССР (1946—55), рэдактар час. «Вожык» (1955—67), гал. рэдактар часопіса «Полымя» (1967—72). Друкуецца з 1943. Аўтар зборніка апавяданняў і нарысаў «Прага бою» (1945), зб. апавяданняў для дзяцей «Згублены дзённік» (1954) і інш., аповесцяў «Андрэйка» (1948), «Лёнька Гром» (1961), «Падзенне Хвядоса Струка» (1967), «Чырвоны лядок» (1969). Узнагароджаны 3 ордэнамі, медалямі.

Тв.: Каб шчаслівa жыць, Мн.; 1953; Апавяданні, Мн., 1956; Сонца ў вокны, Мн., 1962; Малы мужчына, Мн., 1966; Павер, кахаю..., Мн., 1969; Аўтабіяграфічныя лісткі, у кн.: Пяцьдзесят чатыры дарогі, Мн., 1963.

Літ.: Юрчанка Г. Сённяшняе і ўчарашняе, «Полымя», 1963, № 4.

КАВАЛЁЎ Павел Сцяпанавіч [н. 10(23).12.1913, с. Ольша Смаленскага пав.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1944. У Чырв. Арміі з 1935, на фронце з 1941. Вызначыўся ў Віцебскай вобласці. 25.6.1944 батарэя на чале з лейтэнантам К. першая фарсіравала Заходнюю Дзвіну, замацавалася на плацдарме, знішчыла 5 кулямётаў; 2.7.1944 каля ст. Гарчакі знішчыла 5 цягачоў з мінамётамі, 2 варожыя гарматы. Жыве ў Растове-на-Доне.



КАВАЛЁЎ Піліп Іванавіч (1916, в. Гайкоў Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ.— 17.3.1944), Герой Сав. Саюза (1944). З сялян. З 1935 у саўгасе, на з-дзе ў Запарожжы, брыгадзір Чэрыкаўскай МТС. У Чырв. Арміі з 1940. З ліп. 1942 у тыле ворага — камандзір групы падрыўнікоў партыз. брыгады № 255 Гомельскай вобласці. Падарвала 13 дыверсійных груп, пусціў пад адхон 19 варожых эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай, 30 аўтамашын. Загінуў у баі.

Літ.: Люди легенд, в. 1, М., 1965, с. 540—547.

КАВАЛЁЎ Рыгор Сямёнавіч [25.4(8.5).1902, в. Вялікая Крушынаўка Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ.— 18.8.1944], Герой Сав. Саюза (1945). З сялян. Чл. КПСС з 1925. У 1932—41 старшыня калгаса ў Рагачоўскім р-не. Удзельнік вызвалення Зах. Беларусі (1939). У Айч. вайну ў партыз. брыгадзе 8-й Рагачоўскай Гомельскай вобл. У Чырв. Арміі з ліп. 1944, на 3-м Бел. фронце з жн. 1944. Вызначыўся ў баі каля г. Шаўляй Літ. ССР. Каб стрымаць контратаку варожага пяхотнага батальёна, які падтрымлівалі 23 танкі і 9 бронетранспарцёраў, сяржант К. з вязкаю ручных гранат кінуўся пад гусеніцы танка. Натхнёныя яго подзвігам, байцы ўзвода знішчылі яшчэ 3 танкі і адбілі варожую атаку.



КАВАЛЁЎ Сцяпан Маркавіч (1920, в. Фролы Смаленскага пав.— 8.7.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1943. У Чырв. Арміі з 1940. Вызначыўся ў баях пад Мінскам. 8.7.1944 дывізіён на чале з маёрам К. прыняў на сябе гал. ўдар двух варожых палкоў каля в. Самахвалавічы і адбіў 2 контратакі. У рашучы момант бою К. узначаліў контратаку байцоў дывізіёна. Загінуў у баі.

КАВАЛЁЎКА, рака, левы прыток р. Шаць (бас. Пцічы). Даўж. 22 *км*. Цячэ ў Пухавіцкім р-не Мінскай вобл. Вадазбор (64 *км*²) у межах паўд.-зах. ускраіны Цэнтральнабярэзінскай раўніны. Рэльеф дробнаўзгорысты. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 0,4 *м*³/*сек*. К.— водапрыёмнік пры асушэнні балотаў.

КАВАЛІ, вёска ў Бабруйскім р-не Магілёўскай вобл., на р. Беліца. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Аляксандра Неўскага. За 27 *км* на ПдУ ад Бабруйска, 135 *км* ад Магілёва, 1 *км* ад чыг. ст. Цялуша, каля шашы Бабруйск — Жлобін (0,2 *км*). 784 ж., гасп. 302 (1971). Сепаратарны пункт, швейная і шавецкая майстэрні. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, бальніца, аддз. сувязі, 2 магазіны. У 1944 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі. Помнікі на 2 брацкіх магілах сав. воінаў Айч. вайны.

КАВАЛІ, вёска ў Рускасельскім с/с Вілейскага р-на Мінскай вобл., на р. Нарачанка. Цэнтр калгаса «Дружба». За 17 *км* на З ад Вілейкі, 120 *км* ад Мінска, на аўтамаб. дарозе, якая злучае вёску з Вілейкай. 192 ж., гасп. 64 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

КАВАЛІ, вёска ў Глоданскім с/с Лёзненскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса імя Данукалава. За 30 *км* на Пн ад Лёзна, 50 *км* ад Віцебска. 61 ж., дамоў 24 (1971). Б-ка, магазін. У кастр. 1943 ням.-фаш. захопнікі спалілі вёску. Брацкая магіла 11 сав. воінаў і партызан Айч. вайны.

КАВАЛІ, вёска ў Ваверскім с/с Лідскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса імя Жданава. За 23 *км* на ПдЗ ад Ліды, 109 *км* ад Гродна. 209 ж., гасп. 64 (1971). Б-ка, магазін.

КАВАЛІ, вёска ў Ружанскім с/с Пружанскага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр саўгаса «Кавалі». За 61 *км* на ПнУ ад Пружан, 144 *км* ад Брэста, 36 *км* ад чыг. ст. Слонім. 438 ж., гасп. 125 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, сталовая, магазін. Помнік сав. воінам і землякам, якія загінулі ў Айч. вайну.

КАВАЛІ, вёска ў Клясціцкім с/с Расонскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр саўгаса «Гвардыя». За 22 *км* на ПдЗ ад Расонаў, 192 *км* ад Віцебска, 55 *км* ад чыг. ст. Боркавічы. 496 ж., гасп. 154 (1971). Лесапункт, швейная майстэрня. Васьмігадовая школа, клуб, 2 б-кі, дзіцячыя яслі-сад, фельч.-ак. пункт, вет. пункт, аддз. сувязі, 3 магазіны. Помнік сав. воінам, якія загінулі ў Айч. вайну.

КАВАЛІК Сяргей Піліпавіч [13(25).10.1846, маёнтак Сватковічы Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ.— 26.4.1926], адзін з кіраўнікоў народніцкага руху 70-х г. 19 ст. ў Расіі. З дваран. Скончыў Кіеўскі ун-т (1869). Працаваў міравым суддзёй у Чарнігаўскай губ., вёў рэвалюц. прапаганду сярод сялян. У 1873 за мяжою пазнаёміўся з М. А. Бакуніным і падзяляў яго погляды. Арганізоўваў народніцкія гурткі ў Кіеве, Харкаве, Маскве, Яраслаўлі, Ніжнім Ноўгарадзе і інш. Летам 1874 арыштаваны, па працэсе 193-х асуджаны на 10 гадоў катаргі і сасланы ў Сібір; удзельнік этнагр. экспедыцый па Якуціі. З 1898 у Мінску. У час Лют. рэвалюцыі і пасля яе далучаўся да эсэраў. Працаваў у органах сац. забеспячэння БССР. Чл. Мінскага аддзялення Усерас. т-ва паліткатаржан. Аўтар успамінаў, у т. л. «Рэвалюц. рух 70-х гадоў і працэс 193-х» (1928).

КАВАЛІЧЫ, вёска ў Новадарожскім с/с Старадарожскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса «XXII парта'езд». За 15 *км* на ПнУ ад Старых Дарог, 163 *км* ад Магілёва, 5 *км* ад чыг. раз'езда Фалічы. 143 ж., двароў 52 (1971). Лясніцтва, швейная і шавецкая майстэрні. Пач. школа, клуб, б-ка, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін.

КАВАЛЬ (сапр. Кавалёў) Васіль Пятровіч [4(17).8.1907, в. Сава Горацкага пав. Магілёўскай губ.— 29.10.1937], беларускі савецкі пісьменнік. З сялян. У 1928 паступіў у БДУ на літ.-лінгвістычнае аддзяленне, але вучыўся нядоўга. Літ. дзейнасць пачаў з вершаў (1925). Першыя апавяданні надрукаваў у 1926. Уваходзіў у літ. аб'яднанне «Маладняк». Аўтар зб. лірычных абразкоў і апавяданняў «Як вясну гукалі» (1927), «На загонах» (1928), «Крыніца» (1929), аповесці з жыцця Чырв. Арміі «Дзень палымнее» (1932), аповесці для дзяцей «Санька-сігналіст» (1934) і інш. У апавяданнях паказваў побыт і працу сялянства пасля Кастрычніка, даў рэаліст. малюнкі дарэвалюц. сялянскага жыцця, сацыяліст.



перабудовы вёскі. Прозе К. характэрныя рамант. ўзнёсласць, лірызм, яркая паэт. вобразнасць.

Тв.: Выбранае, Мн., 1959; Следапыты, Мн., 1961.
Літ.: Казека Я. Васіль Каваль, «Полымя», 1966, № 1; Пальчэўскі А. Былі ў маці сыны, Мн., 1968, с. 221—227.

КАВАЛЬКІ, вёска ў Белаліпскім с/с Сенненскага р-на Віцебскай вобл., на левым беразе р. Бярозка. Цэнтр калгаса «Бальшавік». За 9 *км* на ПнУ ад Сянна, 91 *км* ад Віцебска, 24 *км* ад чыг. ст. Багушэўская. 24 ж., гасп. 7 (1971). Клуб, б-ка, магазін.

КАВАЛЬСКА-ШТАМПОВАЧНАЯ ВЫТВОРЧАСЦЬ, галіна металаапрацоўкі па вырабе металічных дэталяў ціскам, пераважна *коўкаю* ці *штампоўкаю*. Шырокае выкарыстанне метадаў К.-ш. в. абумоўлена здольнасцю металаў і іх сплаваў дэфармавацца пластычна без разбурэння. Пластычная дэфармацыя з наступнай тэрмічнай апрацоўкаю надае дэталям неабходныя мех. ўласцівасці.

К.-ш. в. развівалася разам з металургіяй бронзы (гл. *Бронзавы век*), потым жалеза (гл. *Жалезны век*), хаця халодная коўка самародпай медзі і жалеза была вядома да таго, як людзі навучыліся здабываць металы з руд. Спецыялізацыя кавальскай вытворчасці адносіцца да 15—16 ст. Да 16 ст. адзіным спосабам кавальскай апрацоўкі было ручное каванне з выкарыстаннем горна, кавадла і кувалды; у 16 ст. з'явіліся першыя мех. молаты з прыводам ад вадзянога кола. На мяжы 18 і 19 ст. пачынаюць выкарыстоўваць машынную штампоўку. Сучаснае машыннае каванне робяць на коваўных молатах з масаю ўдарных частак да 10 *т* і на гідраўл. прэсах з намаганнем да 147 *Мн* (15 000 *тс*). Прадукт кавання — паковкі — атрымліваюць абціскапнем катаных і прасаваных загатовак ці зліткаў плоскімі, выразнымі і радыусными байкамі. Малая дакладнасць памераў і нізкая якасць паверхняў паковак патрабуе іх далейшай апрацоўкі на металарэзных станках. Каваннем робяць пераважна вял. паковкі (масаю больш за 100 *кг*) у маласерыйнай і індывідуальнай вытворчасці, у серыйнай і масавай вытворчасці карыстаюцца штампоўкай. Робіцца спец. інструментам — штампамі. Падаяляецца на аб'ёмную (гарачую і халодную) і ліставую (гарачую і халодную). Дакладнасць памераў дэталяў пры гарачай аб'ёмнай штампоўцы значна вышэйшая, чым пры коўцы, таму дадаткова апрацоўваюць рэзаннем толькі тыя ўчасткі паверхняў дэталяў, што спалучаюцца з інш. дэталямі. Халоднай аб'ёмнай штампоўкай атрымліваюць дэталі, якія звычайна не патрабуюць далейшай мех. апрацоўкі. Гарачая аб'ёмная штампоўка робіцца на парапаветраных штамповачных молатах з масаю ўдарных частак 0,5—25 *т*, на крывашыпных гарачаштамповачных прэсах з намаганнем 4,9—117,5 *Мн*, на гарызантальна-коваўных машынах (1,57—31 *Мн*), а таксама на фрыкцыйных і гідраўл. прэсах, ратацыйна-коваўных машынах, коваўных вальцах і інш; халодная аб'ёмная штампоўка — на халоднавысадачных аўтаматах (прадукц. 30—500 *шт/мін*), на крывашыпна-каленных і гідраўл. прэсах. Ліставою штампоўкаю робяць вырабы з ліста: гарачай — з тоўстых лістоў на гідраўл. прэсах (у судна- і катлабудаванні), халоднай — з тонкіх лістоў высокапластычных металаў на крывашыпных лісташтамповачных прэсах намаганнем 49 *кн* — 49 *Мн*, на крывашыпных рычагова-кулачковых прэсах двайнога і трайнога дзеяння, прэсах-аўтаматах. Дэталі, атрыманыя халоднаю ліставою штампоўкаю, не патрабуюць далейшай мех. апрацоўкі (выраб кузаўных дэталяў аўтамабіляў, трактароў, самалётаў, дэталяў прылад, посуду і г. д.).

У прамысловасці Беларусі К.-ш. в. значна пашырана: буйныя кавальска-штамповачныя цэхі ёсць на многіх з-дах у Мінску (аўтамаб., трактарным, з-дзе шасцерняў, мотавелазаводзе, станкабудаўнічых), у Гомелі (з-д с.-г. машын), прэсавыя цэхі на прыладабудаўнічых з-дах у Мінску, Гомелі, Віцебску, спецыялізаваныя кавальскія цэхі па вырабе запасных частак у Гродне, Кобрыне, Мінску. Гл. таксама *Апрацоўка металаў ціскам*.

Літ.: Кузнечно-штамповочное оборудование, М., 1970; Ковка и объемная штамповка стали. Справочник, под ред. М. В. Сторожева, т. 1—2, 2 изд., М., 1967—68; Романовский В. П. Справочник по холодной штамповке, 5 изд., Л., 1971; Брюханов А. Н. Ковка и объемная штамповка, М., 1960; Барановский М. А. Механизация и автоматизация штамповочного производства, Мн., 1960.
Я. І. Вярбіцкі. Мінск.

КАВАЛЬСКАЯ ЗВАРКА (горнавая зварка), від зваркі металічных дэталяў, нагрэтых у месцы злучэння да цестападобнага стану, потым сумешчаных і абціснутых пад молатам ці прэсам.

К. з. злучаюць пераважна дэталі з малавугляродзістай сталі (да 0,25—0,3% С). Каб павысіць якасць зваркі, месца злучэння пакрываецца флюсам. Пашырана К. з. для наварвання высакаякаснай сталі на зношаныя дэталі.

Літ.: Летнев Б. Я. Кузнечные работы при ремонте сельскохозяйственной техники, М., 1967.

КАВАЛЬСКАЯ ПЕЧ, печ для награвання металу перад коўкай і гарачай штампоўкай.

Бываюць К. п. вугальныя, коксавыя, нафтавыя, газавыя і электрычныя. Эл. К. п. падзяляюцца на печы супраціўлення, кантактавыя і індукцыйныя. Паводле канструкцыі адрозніваюць камерныя і метадычныя; у апошніх загатоўкі перамяшчаюцца канвеерамі. Самая простая К. п.— *горан*.

Літ.: Касенков М. А. Нагревательные устройства кузнечного производства, М., 1962.

КАВАЛЬЧУК Мікалай Пракопавіч [14(26).11.1896, в. Блонь Мінскага пав.— 25.7.1960], удзельнік грамадз. вайны, ген.-м. (1943). З сял. Чл. КПСС з 1919. Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1933), Ваен. акадэмію Ген. штаба (1940). У арміі з 1915, у Чырв. арміі з мая 1918. У 1919—20 на Зах. фронце — палітработнік. У 1933—38 на адказных пасадах у часцях і штабе БВА. Удзельнік сав.-фінляндскай вайны 1939—40 — нач. артылерыі арміі. У Айч. вайну на Волхаўскім і Ленінградскім франтах: нач. артылерыі дывізіі, нам. нач. артылерыі арміі, камандзір дывізіі, нач. штаба арміі. З 1945 нач. штаба ваен. акругі. У 1946—60 ст. выкладчык Ваен. акадэміі Ген. штаба. Узнаг. ордэнам Леніна, 5 інш. ордэнамі, медалямі, 2 ордэнамі ПНР.

КАВАЛЬЧУК Уладзімір Мікалаевіч (н. 2.2.1929, Гомель), беларускі савецкі спявак (бас). Засл. арт. БССР (1968). Працаваў слесарам, шафёрам, матарыстам. Спяваць пачаў у самадзейным калектыве Гомельскага палаца культуры чыгуначнікаў імя Леніна. З 1952 саліст Дзярж. нар. хору БССР.

КАВАЛЯРОВІЧ (Kawalerowicz) Ежы (н. 19.1.1922, мяст. Гваздзец), польскі кінарэжысёр, сцэнарыст. З 1947 працуе ў кіно. Фільмы: дылогія «Цэлюлоза» (у сав. пракаце «Дарогі жыцця», 1954) і «Пад фрыгійскай зоркай» [1954, прэмія Барацьбы за сац. прагрэс 8-га Міжнар. кінафестывалю (Мкф) у Карлавых Варах], «Цень» («Хто ён?», 1956), «Сапраўдны канец вялікай вайны» («Гэтага нельга забыць», 1957), «Поезд» (1959), «Маці Іаана ад анёлаў» (1961, прыз 14-га Мкф у Кане), «Фараон» (1965). Дзярж. прэміі ПНР 1950, 1955.

Літ.: Соболев Р. П. Ежи Кавалерович, М., 1965.

КАВАСАКІ, горад у Японіі, на в-ве Хонсю, у прэфектуры Канагава. Размешчаны паміж Токіо і Іакагамай на ўзбярэжжы Такійскага заліва. Марскі порт. 910 тыс. ж. (1968). Найб. суднабуд. і суднарамонтны цэнтр краіны. Металургічная, маш.-буд., эл.-тэхн., харч. і тэкст. прамысловасць. Хім., нафтаперапр. і цэментавыя з-ды.

КАВАЦІНА (італьян. cavatina), невялікая оперная арыя лірыка-апавядальнага характару, песеннага складу і простай будовы. Зрэдку трапляюцца 2-часткавыя К. з тэмпавым кантрастам. К. часам называюць напеўныя інструментальныя п'есы.

КАВЕЛІН (ад імя італьян. мінералога Н. Кавелі), меднае індыга, мінерал, сульфід медзі CuS. Каштоўная медная руда.

Змяшчае Cu да 66,5%, прымесі Fe, часам Se, Ag, Pb. Крышталі гексаганальнай сістэмы, таблітчастай формы. Найчасцей трапляюцца зямлістыя, сажыстыя агрэгаты, скарынкі. Крохкі. Колер індыгавасіні, у зямлістых агрэгатах — сінявата-чорны. Бляск паўметалічны, цьмяны. Цв. 1,5—2; шчыльн. 4590—4700 *кг/м*³. Пашыраны ў зоне выветрывання меднасульфідных радовішчаў.

КАВЕНЬЯК (Cavaignac) Луі Эжэн (5.10.1802—28.10.1857), французскі дзярж. дзеяч, генерал. У 1831—48 удзельнічаў у завяванні Алжыра. У лютым — маі 1848 ваен. губернатар Алжыра; у маі — чэрв. 1848 ваен. міністр Францыі. Жорстка задушыў *Чэрвеньскае паўстанне 1848* рабочых Парыжа. З 29 чэрв. да 20.12.1848 узначальваў урад. Імя К. як ката рабочых стала назыўным.

КАВЕРНА (лац. caverna поласць), 1) поласць у органе (лёгкіх, нырках і інш.), якая ўзнікла ад некрозу і распаду яго тканак пры паталагічных працэсах (туберкулёз, рак, сіфіліс, сілікоз). 2) Пустоты круглявой формы ў горных пародах, якія ўзнікаюць ад растваральнага дзеяння вады, пры застыванні лавы і інш.

КАВЕРНАМЕТРЫЯ, вызначэнне зменлівасці дыяметра свідравіны.

Ад дзеяння буравога інструменту і буравога раствору на горныя пароды ў свідравіне дыяметр яе можа быць большы ці меншы за дыяметр буравога долата ці каронкі. Дыяметр свідравіны вымяраюць кавернамерам. Паводле вымярэнняў складаюцца кавернаграмы, якімі карыстаюцца пры вывучэнні тэхн. стану свідравіны, падліку патрэбнай колькасці цэменту пры цэментацыі свідравіны (гл. *Бурэнне*), пры геафіз. метадах выпрабавання свідравін і інтэрпрэтацыі геафіз. дыяграм (гл. *Каратаж*) для ўдакладнення геал. разрэзу і інш.

КАВІТАЦЫЯ (лац. cavitas пустата), парушэнне суцэльнасці цякучай вадкасці. Узнікае там, дзе ціск унутры вадкасці падае ніжэй за т. зв. крытычны.

У месцах паніжанага ціску растворапыя ў вадкасці пара-газавыя пузыркі большаюць і ператвараюцца ў вялікія кавітацыйныя пузыры-каверны. Калі такі пузыр патокам вадкасці заносіцца ў месца з большым, чым крытычны, ціскам, пузыр знікае, што суправаджаецца ўдарам, падобным да гідраўлічнага. Пры шматразовым паўта-



Грабны вінт рыбалоўнага траўлера пасля двух гадоў эксплуатацыі.

рэнні гэтыя ўдары разбураюць паверхні грабных вінтоў (гл. рыс.), лопасцей гідратурбін і інш., зніжаюць іх ккд.

Літ.: Перник А. Д. Проблемы кавитации, 2 изд., Л., 1966; Фомин В. В. Гидроэрозия металлов, М., 1966.

КАВУНЫ (Citrullus), род адна- і шматгадовых травяністых раслін сям. гарбузовых. Вядома 5 відаў. Дзіка растуць пераважна ў Паўд. Афрыцы. У культуры 2 віды: К. сталовы (C. aedulus) і К. кармавы (C. colocynthoides). У СССР вырошчваюцца на Паўн. Каўказе, Украіне, у Паволжы, Сярэдняй Азіі, Казахстане.



Кавун (сорт Скараспелка харкаўская).

К. сталовы — аднагадовая расліна. Плады з сакаўною, салодкаю (5—13% цукру), руноваю, чырвонаю і белаю мякаццю; каштоўны харчовы і дыетны прадукт. Вегет. перыяд скараспелых сартоў 95—120 дзён. На Беларусі могуць выспяваць у Гомельскай і Брэсцкай абл.; найлепшыя сарты: Стокс, Скараспелка харкаўская, Скіпрскі скараспелы, Улюбёнец хутара Пяцігорска.

Літ.: Рубцов М. И. и Матвеев В. П. Овощеводство, М., 1970. *П. С. Шастапал.* Мінск.

КАВЯЗІН Мікалай Аляксандравіч [3(15).9.1898, Жлобін — 9.3.1950], беларускі савецкі рэжысёр, педагог, мастак, тэатральны дзеяч. Засл. арт. БССР (1949). Удзельнік Айч. вайны. Арганізатар і маст. кіраўнік Бел. т-ра юнага гледача імя Крупскай (1931—37), Палескага т-ра імя Я. Купалы (1944—45), Бабруйскага абл. драм. т-ра (1945), Гродзенскага драм. т-ра (з 1947). Пастаноўкі К. вызначаліся тэатральнасцю, дакладнай формаю, выразным раскрыццём ідэі твора. Рэж. і мастак спектакляў: «Наш» М. Зныка (1932), «Вінтоўка № 492116» А. Крона і «Шлях далёкі» М. Шастакова (1933), «Дружына» А. Бруштэйн (1935), «Мікола Гоман» В. Сташэўскага (1936). Рэж. спектакляў: «Без віны вінаватыя» (1945) і «Праўда добра, а шчасце лепш» (1946) А. Астроўскага, «Так і будзе» (1945), «Рускае пытанне» (1947) і «Чужы цень» (1949) К. Сіманава, «Дама-невідзімка» П. Кальдэрона (1946), «Вялікая сіла» Б. Рамашова і «Маскоўскі характар» А. Сафронава (1948), «Шчасце» паводле П. Паўленкі (1949), «На дне» М. Горкага (1950). Узнаг. ордэнам «Знак Пашаны».



Літ.: Есакоў А. Мікола Кавязін, у кн.: Слова пра майстроў сцэны, Мн., 1967.
М. У. Кавязіна. Гродна.

КАВЯЗІНА (дзявочае Заборская) Марыя Уладзіміраўна [н. 12(25).10.1911, Мінск], беларуская савецкая актрыса. Засл. арт. БССР (1956). Працавала ў т-рах: юнага гледача імя Крупскай (1931—41), Палескім імя Я. Купалы (у 1945), Бабруйскім (1946—47), Гродзенскім (з 1947). Характарная актрыса. Ролі ў Т-ры юнага гледача: Пашка («Наш» М. Зныка), Ірад («Вінтоўка № 492116» А. Крона),

Маці («Як гартавалася сталь» паводле М. Астроўскага); у Палескім т-ры — цёця Каця («Хто смяецца апошнім» К. Крапівы); у Гродзенскім т-ры: Кукушкіна, Мурзавецкая, Гурмыжская («Даходнае месца», «Ваўкі і авечкі», «Лес» А. Астроўскага), Васа, Соф'я, Багаеўская, Насця («Васа Жалязнова», «Апошнія», «Варвары», «На дне» М. Горкага), Дульская («Мараль пані Дульскай» Г. Запольскай), Марыя («Марыя Цюдар» В. Гюго), Стафанія («Год адзяйсненняў» П. Васілеўскага).

КАВЯРЗНІ, лыкавыя лапці. Гл. *Коверзні.*

КАВЯЧЫНСКІ Мацей (г. н. невядомы — да 1572), беларускі кнігавыдавец, перакладчык «святога» пісання. З шляхты. Вучыўся ў Вітэнбергскім ун-це. Удзельнік рэфармацыйнага руху ў Літве, Польшчы і Беларусі. У 1561—62 з Сымонам Будным і Л. Крышкоўскім заснаваў Нясвіжскую пратэстанцкую друкарню, пасля 1563 паперню (прадпрыемства па вырабе паперы). За 1562—72 надрукавалі больш за 10 кніг, пераважна пераклады «святога» пісання, творы Г. Паўла, М. Чаховіца, С. Буднага і інш. У 1571 друкарня па загадзе Крыстофа Радзівіла Сіроткі спыніла дзейнасць і ў хуткім часе браты Кавячынскага прадалі яе магнату Яну Кішку.

Літ.: Merczyng H. Szymon Budny jako krytyk tekstów biblijnych. Kraków, 1913; Drukarze dawnej Polski, zesz. 5, Wrocław — Kraków, 1959.
Г. Я. Галенчанка. Мінск.

КАГАДЗЕЕЎ Аляксей Пятровіч (н. 7.4.1926, с. Альхаватка Янакіеўскага р-на Арцёмаўскай акр. УССР), беларускі савецкі хормайстар. Нар. артыст БССР (1971). Чл. КПСС з 1962. Скончыў Бел. кансерваторыю ў 1955. З 1959 хормайстар, з 1960 гал. хормайстар Бел. т-ра оперы і балета, з 1958 таксама выкладчык Бел. кансерваторыі. Узнаг. ордэнам «Знак Пашаны».



Літ. тв.: В помощь дирижеру хора, Мн., 1968; Техника хорового дирижирования (элементарные основы), Мн., 1968.

КАГАЛ (стараяўр. — сход), абшчына і абшчыннае самакіраванне яўрэяў у Рэчы Паспалітай. Узнік у 13 ст., на Беларусі ў 16 ст., групаваўся вакол сінагогі і рабіна. Малы К. (прыкагалак) у невялікіх гарадах і мястэчках падпарадкоўваўся К. ў вялікіх гарадах.

Кіравалі К. выбраныя на год старэйшыя і паважаныя члены, у распараджэнні якіх былі кантралёры даходаў, зборшчыкі падаткаў, суддзі (даяны) і інш. Фактычна К. кіравалі алігархічныя вярхі, якія эксплуатавалі працоўных яўрэяў. Урад Рэчы Паспалітай падтрымліваў К., які калектыўна здаваў падаткі ад яўрэяў у дзярж. скарб. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) царскі ўрад захаваў К. з-за фінансавых меркаванняў, а з 1827 усклаў на К. і пастаўку рэкрутаў. Афіцыйна скасаваны ў 1844. Як рэлігійна-саслоўная арганізацыя яўрэяў К. адыгрывалі рэакц. ролю. Яны штучна адасабляліі і процістаўляліі яўрэяў астатняму насельніцтву бел. гарадоў, аддавалі працоўных яўрэяў у поўнае падпарадкаванне купецка-ліхвярскім вярхам, якія ў 19 ст. ператварыліся ў яўр. буржуазію.
А. П. Грыцкевіч. Мінск.

КАГАНЕЦ (свяцільня, плошка), гліняная ці металічная пасудзіна накшталт місачкі або гаршчочка, напоўненая тлушчам, з кнотам пасярэдзіне. Выкарыстоўваўся для асвятлення жылля.

КАГАНЕЦ Карусь (сапр. Кастравіцкі Казімір Карлавіч; 10.2.1868, Табольск — 20.5.1918), беларускі пісьменнік, мастак і скульптар. Сын паўстанца 1863, сасланага ў Сібір. З 1874 на Беларусі. У 1885—88 вучыўся ў Маск. вучылішчы жывапісу, ваяння і дойлідства. Працаваў у маст. майстэрні ў Рызе, настаўнікам малявання, ляснічым. Збіраў бел. фальклор, нар. лексіку. Адзін з арганізатараў *Беларускай сацыялістычнай грамады.* За агіт. дзейнасць сядзеў у Мінскай турме (1905—06, 1910—11). Літ. дзейнасць пачаў у 1893. Вершы К. пра нар. побыт і сялянскую працу («Наша ніўка», «На сяле вечарамі», «Жняя»), нац. праблемы («Плач беларуса»), на гістар. тэматыку («У тры шляхі ідуць ляхі», «Сцяты камень»). Творы на гістар. тэмы ідэалізуюць мінулае Беларусі. Апрацоўваў бел. нар. казкі («Журавель і чапля», «Што кажух, то не вата»), паданні («Навасадскае замчышча», «Прылукі»). У вадэвілі «Модны шляхцюк» (паст. 1910 у Вільні і Полацку *Першай беларускай трупай Ігната Буйніцкага*) высмеяў пагардлівыя адносіны паноў да народа, паказаў харство душы простых людзей вёскі. Аўтар драмы «У іншым шчасці няшчасце схавана» (нап. 1903, апубл. 1919), камедыі «Двойчы прапілі» (нап. 1910, апубл. 1919), гістар. драм «Старажовы курган», «Сын Даніла». Пераклаў на бел. мову навукова-папулярную кніжку «Гутаркі аб небе і зямлі» (выд. 1907). Многія творы не апублікаваны. Займаўся скульптурай, выразаў з дрэва і косці, маляваў («Маці», «За сахою», «На ростанках»), афармляў кнігі (вокладка кнігі Я. Коласа «Другое чытанне для дзяцей беларусаў», П., 1909). Аўтар першага «Беларускага лемантара» (выд. ананімна 1906).



К. Каганец. За сахою. Малюнак. Пач. 20 ст.



Тв.: У кн.— Дварчанін І. Хрестоматыя новай беларускай літаратуры, в. 1, Вільня, 1927; Беларуская дакастрычніцкая проза, Мн., 1965; Беларуская дакастрычніцкая паэзія, Мн., 1967; Модны шляхцюк, у кн.: П'есы, Вільня, [б. г.] (Беларускі тэатр. Сшытак № 1).

Літ.: Гісторыя беларускай дакастр. літаратуры, т. 2, Мн., 1969. *С. Х. Александровіч.* Мінск.

КАГАТНАЯ ГНІЛЬ БУРАКОЎ, хвароба каранёў буракоў пры іх хаванні, якая выклікаецца грыбамі і бактэрыямі. Пашкоджаныя тканкі адміраюць і распадаюцца.

К. г. б. бывае сухая і мокрая. Узбуджальнікі хваробы трапляюць у кагаты з часцінкамі глебы і рэшткамі раслін. У залежнасці ад узбуджальнікаў адрозніваюць бурую, цёмна-бурую, чорную або шэрую гніль. Пашкоджаныя карані трацяць цукар, непрыгодны на корм жывёле, губляюць усхожасць, тэхнал. працэс іх перапрацоўкі ўскладняецца. Меры барацьбы: бракоўка механічна пашкоджаных, вялых, падмарожаных каранёў; апрацоўка вапнай, гашанай за 6—7 дзён да ўжывання; хаванне пры аптымальнай т-ры (1—2 °С).

Літ.: Шевченко В. Н. Кагатная гниль сахарной свеклы, у кн.: Свекловодство, т. 3, ч. 2, 2 изд., Киев, 1959.
А. С. Шуканай. Мінск.

КАГЕРЭНТНАСЦЬ (ад лац. cohaerens тое, што знаходзіцца ў сувязі), наяўнасць нязменных суадносін паміж фазамі розных ваганняў. Самыя простыя кагерэнтныя ваганні — два *гарманічныя ваганні* з аднолькавымі частотамі і пастаяннай рознасцю фаз.

Кагерэнтныя хвалі пазнаюць, напр., ад двух генератараў, якія працуюць на адной стабілізаванай частаце, а кагерэнтныя светлавыя хвалі (пры лазерных крыніцах святла) толькі дзяленнем пучка хвалі ад адной крыніцы (гл., напр., рыс. *а* ў арт. *Інтэрферэнцыя*). К. — неабходная ўмова ўзнікнення інтэрферэнцыі. Ступень К. апісваецца карэляцыйнымі функцыямі, якія могуць быць вылічаны ці знойдзены эксперыментальна (па кантрастнасці і размяшчэнні інтэрферэнцыйных палос). Паняцце К. ужываецца ў хвалевай і квантавай оптыцы, квантавай механіцы, радыёфізіцы, радыётэхніцы.

Літ.: Франсон М. и Сланский С. Когерентность в оптике, пер. с франц., М., 1967; Борн М. и Вольф Э. Основы оптики, пер. с англ., М., 1970; Клаудер Дж. и Сударшан Э. Основы квантовой оптики, пер. с англ., М., 1970.
Б. А. Соўкі. Мінск.

КАГУЦЕНКА Аляксандр Гаўрылавіч (н. 11.2.1925, в. Царкавішча Магілёўскага р-на), кавалер ордэнаў Славы трох ступеняў. З сялян. Скончыў Уральскі політэхн. ін-т (1954). У Чырв. Арміі з 1942; на фронце з ліп. 1943 — ст. сяржант, камандзір аддз. аўтаматчыкаў. Удзельнік баёў на Паўд.-Зах., 3-м Укр. і 1-м Бел. франтах, вызвалення Славянска, Запарожжа, Любліна, Варшавы, штурму Берліна. Вызначыўся 1.8.1944 пры фарсіраванні Вісты; у студз. 1945 каля в. Ліпскія Буды (Польшча) першы са сваім аддзяленнем авалодаў варожымі траншэямі; 29.4.1945 у Берліне з групай байцоў ліквідаваў супраціўленне ворагаў у адным з дамоў. Жыве ў Калінінградзе Маскоўскай вобл.

КАДАВІЛЬЯ (Codovilla) Вікторыо (8.2.1894, в. Атабіяна, прав. Павія, Паўднёвая Італія — 15.4.1970), дзеяч аргенцінскага і міжнароднага рабочага і камуніст. руху. З сям'і дробнага гандляра. З юнацкіх гадоў актыўна ўдзельнічаў у маладзёжным сацыяліст. руху Італіі, затым уступіў у Сацыяліст. партыю Італіі. Ад праследаванняў за рэвалюц. дзейнасць эмігравaў у 1912 у Аргенціну, дзе адразу ўключыўся ў работу арг. Сацыяліст. партыі і скора ўзначаліў яе левае крыло. У 1-ю сусв. вайну займаў інтэрнацыяналісцкую пазіцыю, падтрымліваў У. І. Леніна па пытаннях вайны і міру. Арганізатар выступленняў аргенцінскіх працоўных у абарону маладой Савецкай рэспублікі. Адзін з заснавальнікаў кампартыі Аргенціны (КПА) у 1918 і чл. яе кіруючых органаў з моманту заснавання партыі. У 1926—28 прадстаўнік КПА пры Выканкоме Камінтэрна, у 1928—30 сакратар Паўд.-амер. бюро Камінтэрна. Займаў інш. адказныя пасады ў Камінтэрне. У 1941—63 сакратар ЦК КПА, з 1963 старшыня КПА. За рэвалюц. дзейнасць няраз зняволваўся і ссылаўся. Узначальваў дэлегацыі КПА на XIX, XX, XXII і XXIII з'ездах КПСС, на міжнар. Нарадзе прадстаўнікоў камуніст. і рабочых партый 1957 у Маскве. Аўтар многіх прац па пытаннях рабочага і камуніст. руху.



Тв.: Рус. пер.— Избр. ст. и речи, М., 1970.

КАДАНЧЫК Сяргей Мікалаевіч [30.8(12.9). 1906, в. Майсеёўка Бабруйскага пав. Мінскай губ.— 15.9.1943], Герой Сав. Саюза (1943). З сялян. Чл. КПСС з 1940. У Чырв. Арміі з 1928. Удзельнік вызвалення Зах. Беларусі (1939), сав.-фінляндскай вайны 1939—40. У Айч. вайну на Паўд., Паўд.-Зах., Закаўказскім, Паўн.-Каўказскім франтах — камандзір палка. Вызначыўся ў вер. 1943 пры вызваленні Новарасійска. Полк, якім камандаваў К., штурмам авалодаў умацаваннямі і ўтварыў пралом у варожай абароне, што садзейнічала паспяховаму наступленню сав. войск. Загінуў у гэтым баі. Пахаваны ў Геленджыку.



КАДАР (Kádár) Янаш (н. 26.5.1912, г. Рыека), дзеяч венгерскага і міжнар. рабочага і камуніст. руху, парт. і дзярж. дзеяч ВНР. З сям'і с.-г. рабочага. Пачаў працаваць з дзяцінства. З 17 гадоў уключыўся ў рабочы рух. У 1931 уступіў у Камуніст. саюз рабочай моладзі, у тым жа годзе — у кампартыю Венгрыі (КПВ). У 2-ю сусв. вайну на кіруючай рабоце



ў КПВ, якая дзейнічала ў падполлі. З 1942 член, з 1943 сакратар ЦК КПВ. Няраз знявольваўся харцісцкімі ўладамі. Пасля вызвалення краіны займаў кіруючыя пасады ў партыі і дзяржаве — дэпутат Часовага нац. сходу, чл. Палітбюро і сакратарыята ЦК КПВ. У 1946—48 нам. ген. сакратара ЦК КПВ, у 1948—50 нам. ген. сакратара ЦК Венгерскай партыі працоўных (ВПП). З 1948 адначасова міністр унутр. спраў. У крас. 1951 беспадстаўна абвінавачаны і зняволены. У 1954 рэабілітаваны. У ліп. 1956 пленум ЦК ВПП увёў К. ў склад ЦК, выбраў чл. Палітбюро і сакратаром ЦК партыі. У час *контррэвалюцыйнага мяцяжу 1956 у Венгрыі* К. узначаліў барацьбу за згуртаванне і мабілізацыю рэвалюц. сіл краіны, стаў ініцыятарам стварэння Венг. рэвалюц. рабоча-сялянскага ўрада, узнаўлення і ўмацавання партыі венг. рабочага класа. У ліст. 1956 — чэрв. 1957 старшыня часовага ЦК, з чэрв. 1957 першы сакратар ЦК ВСРП. З ліст. 1956 старшыня Венг. рэвалюц. рабоча-сялянскага ўрада, з студз. 1958 дзярж. міністр, з вер. 1961 да чэрв. 1965 зноў старшыня ўрада. Герой Сац. Працы ВНР. Паслядоўна выступае за ўмацаванне адзінства міжнар. камуніст. руху на аснове прынцыпаў марксізма-ленінізма, пралетарскага інтэрнацыяналізму. Узначальваў дэлегацыі ВСРП на XXI—XXIV з'ездах КПСС, на міжнар. Нарадах камуніст. і рабочых партый у Маскве 1957, 1960, 1969. У 1966 на чале дэлегацыі ВСРП наведаў БССР.

Тв.: Рус. пер.— Избр. ст. и речи (1957—1960 гг.), М., 1960; тое ж. (май 1960 г.— апр. 1964 г.), М., 1964; тое ж. (окт. 1964 г.— апр. 1970 г.), М., 1970.

КАДА́СТР (франц. cadastre вопіс), сістэматызаваны збор звестак, які складаецца перыядычна або бесперапынным назіраннем за адпаведным аб'ектам. Існуюць *зямельны кадастр*, падатковы (перапіс насельніцтва па душах для падатковага абкладання), водны (звесткі пра воды краіны) і інш.

КА́ДАЎБ (кадаўбец, кадоўбчык), посуд, выдзеўбаны з дрэва, найчасцей з ліпы або алешыны. Выкарыст. пераважна пад збожжа, крупы, муку. Ёмістасць да 20—25 пудоў. К. былі пашыраны ў лясных і падлесных зонах Беларусі і інш. краін. Зберагліся на Пд Беларусі.

КА́ДАЧНІКАЎ Іван Пятровіч [19.6 (2.7).1911, в. Вядзернікі Пермскага пав.— 25.8.1967], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС. На фронце з 1943. Вызначыўся ў вер. 1943 пры фарсіраванні Дняпра ў Камарынскім р-не Палескай вобл. На лодках і плытах трое сутак перапраўляў пяхоту і артылерыю на правы бераг.

КАДЗІ́ЛА (Melittis), род шматгадовых травяністых раслін сям. губакветных. Вядома каля 10 відаў, пашыраных у Еўропе. У СССР 2, на Беларусі К. сармацкае (M. sarmatica, нар. назвы: бальсан, лясная табака).

К. сармацкае — духмяная расліна з прамастойным, апушаным сцяблом, выш. 20—50 (80) см. Лісце яйцападобнае або эліптычнае. Кветкі белыя з ружовай ніжняй губою, сабраныя ў кальчакі ў пазухах верхняга лісця. Плод — арэшак. Расце ў шыракалістых і мяшаных лясах, асабліва многа ў Белавежскай пушчы. Лекавая расліна (мае кумарын, флаваніды, эфірны алей).

Літ.: Гл. пры арт. *Лекавыя расліны*.



Кадзіла сармацкае: *1* — галінка з кветкамі і лісцем; *2* — плод.

КА́ДЗІНА, вёска ў Дарскім с/с Магілёўскага р-на. Цэнтр саўгаса «Кадзіна». За 12 *км* на ПдУ ад Магілёва, 12 *км* ад чыг. ст. Лупалава, каля шашы Магілёў — Чавусы (2 *км*). 279 ж., гасп. 102 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Пач. школа, клуб, б-ка, дзіцячыя яслі-сад, фельч.-ак. пункт, магазін. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў Айч. вайны.

КАДЗІ́РАВАННЕ, пераўтварэнне інфармацыі з дапамогай *кода* пры яе перадачы, пераапрацоўцы, захаванні, складанні праграм электронна-вылічальных машын, пры перадачы *камандаў* у сістэмах тэлекіравання і інш.

Мэта К.— дапасаванне тэхн. характарыстык крыніцы паведамленняў да каналаў сувязі, каб забяспечыць найбольшую хуткасць перадачы ці зададзеную ўстойлівасць да перашкод. К. паведамленняў, складзенае з паслядоўнасці элементаў A_k ($k=1, 2, 3, \ldots, n$), зводзіцца да вызначэння адназначнай адпаведнасці паміж кожным элементам A_k і пэўным кодам.

КА́ДМІЙ (Cadmium), Cd, хім. элемент II групы перыяд. сістэмы Мендзялеева, ат. н. 48, ат. м. 112,40. Адкрыты ў 1817. У зямной кары $1{,}3 \cdot 10^{-5}$% па масе, знаходзіцца пераважна ў цынкавых рудах. Прыродны К. складаецца з 8 стабільных ізатопаў з масавымі лікамі ад 106 да 116 (акрамя 107, 109, 115).

К.— серабрыста-белы з сіняватым адлівам метал, мяккі і коўкі, *t* пл. 321 °С, *t* кіп. 767 °С, шчыльн. 8650 *кг/м*³. Раствараецца ў неарган. к-тах. На паветры зацягваецца вокіснай плёнкай, якая ахоўвае яго ад далейшага акіслення. У злучэннях заўсёды двухвалентны. У арганізме чалавека знаходзіцца 10^{-4}%, канцэнтруецца ў печані і нырках. Растваральныя ў вадзе солі К. атрутныя.

Выкарыстоўваецца ў ядзерных рэактарах, у шчолачных акумулятарах, у лёгкаплаўкіх сплавах; $CdSO_4$ і амальгама К.— у нармальных элементах, CdS — пігмент для прыгатавання алейных фарбаў.

Літ.: Чижиков Д. М. Кадмий, 2 изд., М., 1967.

КАДО́Н (трыплет), паслядоўнасць трох сумежных азоцістых асноў у малекуле нуклеінавых кіслот, якая вызначае размяшчэнне пэўнай амінакіслаты ў поліпептыдным ланцугу малекулы бялку; элемент (адзінка) *генетычнага кода*.

КАДР, кінакадр (франц. cadre літар. рама), 1) асобны фатаграфічны здымак на кінаплёнцы. 2) Мантажны К.— састаўная частка

фільма, дзе зняты асобны момант дзеяння з захаваннем яго бесперапыннасці. 3) Сцэнарны К. (у рэжысёрскім сцэнарыі фільма) — пераказ зместу і апісанне кожнага К., які здымаецца асобна.

КА́ДРАВАЯ А́РМІЯ, пастаянная рэгулярная *армія* (узброеныя сілы), якая ў мірны час у паменшаным складзе камплектуецца і забяспечваецца дзяржаваю, мае штатныя кадры для абучэння кантынгентаў, якія штогод прызываюцца. Аснова для разгортвання ўзброеных сіл пры мабілізацыі, першы эшалон дзейнай арміі ў пачатку вайны.

К. а. з'явілася ў пач. 19 ст. пры стварэнні бурж. нац. армій (Францыя, Прусія) на аснове ўсеагульнай вайсковай павіннасці. У Расіі створана ў 70-я г. 19 ст. Сав. Армія пачала фарміравацца на аснове ўсеагульнага вайсковага абавязку з мая 1918. Агрэс. палітыка імперыяліст. дзяржаў, гонка ўзбраенняў прывялі да непамернага павелічэння К. а. ў капіталіст. краінах (гл. раздз. «Узброеныя сілы» ў арт. пра адпаведныя краіны).

КА́ДРЫ (франц. cadres), асноўны, пастаянны склад спецыялістаў прадпрыемстваў, устаноў, арг-цый, арміі; у СССР — пастаянны склад кваліфікаваных рабочых, калгаснікаў, спецыялістаў усіх галін гаспадаркі, работнікаў навукі і культуры, парт., сав., гасп., прафс., камсамольскіх, каап. і інш. грамадскіх арг-цый, ваеннаслужачых і інш. Партыя і сав. ўрад надаюць выключную ўвагу падбору, вылучэнню і выхаванню кадраў. У. І. Ленін у шэрагу прац вызначыў прынцыпы падбору кадраў і адносіны да іх. Гэтыя прынцыпы, распрацаваныя ў рашэннях з'ездаў, канферэнцый і Пленумаў ЦК КПСС, уключаюць патрабаванні: падбіраць К. па паліт., дзелавых якасцях, здольнасцях і добрасумленнасці; клапатліва вырошчваць і чула ставіцца да іх; расстаўляць парт. і дзярж. работнікаў у адпаведнасці з паліт. лініяй Кампартыі. XXIV з'езд КПСС (1971) звярнуў увагу на тое, каб усе ўчасткі парт., дзярж., гасп., культурна-выхаваўчай і грамадскай работы ўзначальвалі палітычна сталыя, здольныя арганізатары, якія ведаюць справу, каб кіруючыя К. дасканала валодалі сучаснымі метадамі кіравання, пачуццём новага, бачылі перспектыву развіцця, умелі знаходзіць найб. эфектыўныя шляхі вырашэння праблем, выкарыстоўвалі веды і вопыт іншых, клапатліва ставіліся да старых кадраў, максімальна выкарыстоўвалі іх вопыт і веды, вылучалі маладых, перспектыўных работнікаў.

Праблема К. паўстала з першых дзён Сав. улады. Мільёны працоўных прыйшлі да кіравання краінай праз Саветы. Іх вылучалі на кіруючыя пасады часта без патрэбных ведаў і вопыту. На рабоце ў дзярж., гасп. апараце, арміі давялося выкарыстаць і бурж. спецыялістаў. У ліп. 1920 У. І. Ленін падпісаў дэкрэт «Аб навуковай прафесійна-тэхнічнай павіннасці». У канцы 1920 побач з кароткатэрміновымі, вячэрнімі курсамі і індывідуальным навучаннем на прадпрыемствах былі адкрыты школы ФЗН. У 1940 для забеспячэння прамысловасці, буд-ва і транспарту кваліфікаванымі рабочымі створана сетка вучылішчаў і школ *прафесійна-тэхнічнай адукацыі* сістэмы працоўных рэзерваў. У 1945—66 у гэтай сістэме падрыхтавана больш за 17 млн. кваліфікаваных рабочых, у т. л. ў БССР у 1945—67 — 467,5 тыс. Да 1941 у нар. гасп. СССР працавала 2,4 млн., у 1967 — 13 млн. спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй спец. адукацыяй (у 1913 — 190 тыс.). Вырашана праблема стварэння нац. К. ва ўсіх саюзных і аўт. рэспубліках і абласцях. У нар. гасп. БССР у 1970 працавала каля 580 тыс. спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй спец. адукацыяй. У 1970 у СССР было 4790 прафесійна-тэхнічных вучылішчаў сістэмы Дзярж. к-та Савета Міністраў СССР, у якіх вучыцца каля 2 млн. чал., у т. л. ў БССР 152 вучылішчы і 3 індустрыяльна-пед. тэхнікумы, якія рыхтуюць К. больш чым па 240 розных прафесіях, выпускаюць штогод 57 тыс. спецыялістаў. З 1953 у гэтай сістэме рыхтуюць К. механізатараў с. гасп. Шырокая сетка прафес.-тэхн. навучання, усеагульнае абавязковае навучанне ў агульнаадукацыйных школах узнялі прафесійны і агульнаадукацыйны ўзровень працоўных. Для гасп. кіраўнікоў і спецыялістаў створаны ін-ты ўдасканалення, ф-ты і курсы павышэння кваліфікацыі, Ін-т кіравання нар. гаспадаркай. У СССР у 1970 на 1000 занятых у вытворчасці работнікаў з вышэйшай і сярэдняй (поўнай і няпоўнай) адукацыяй прыпадае 653 чал.; у БССР — 594 чал. Гл. таксама арт. *Рабочы клас, Сялянства, Інтэлігенцыя*.

Літ.: Ленін У. І. Чарговыя задачы Савецкай улады, Тв., т 27 (Полн. собр. соч., т. 36); яго ж. Як нам рэарганізаваць Рабкрын.— Лепш менш, ды лепш, Тв., т. 33 (там жа, т. 45); Брэжнеў Л. І. Справаздачны даклад Цэнтральнага Камітэта КПСС XXIV з'езду Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Мн., 1971; Матэрыялы XXVII з'езду Камуністычнай партыі Беларусі, Мн., 1971.

С. Л. Саламаха. Мінск.

КАДРЫ́ЛЯ (франц. quadrille), танец, пашыраны ў многіх еўрапейскіх краінах.

Цотная колькасць пар становіцца па вуглах квадрата або ў дзве лініі адна супраць адной. У танцы некалькі частак — «кален», кожнае мае сваю назву, мелодыю (муз. памер пераважна $^2/_4$) і вызначаны парадак рухаў. Асн. ходы К.— просты крок або бег. У 18—19 ст. была папулярным салонным танцам, пазней уваходзіць у побыт многіх народаў як нац. танец. Захоўваючы толькі сваю кампазіцыйную схему, К. трансфармуецца пад уплывам мясцовых харэаграф. традыцый. На Беларусі мае мноства варыянтаў — «Ланская», «Турэйская», «Смаргонская», «Воранаўская», «З пятага» і інш.

Ю. М. Чурко. Мінск.

КАДУЧЭ́НКА Іосіф Андрыянавіч [н. 31.10 (13.11).1906, в. Старая Ушыца Ушыцкага пав. Падольскай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1941). Чл. КПСС з 1927. У Чырв. Арміі з 1928, на фронце з 1941. Вызначыўся ў ліп. 1941 у баі пад Барысавам. Дзве роты танкаў на чале з К. разбілі танкавую калону і знішчылі 9 танкаў ворага. Жыве ў Запарожжы.

КАДЫЛІ́НСКІ Барыс Паўлавіч (н. 5.8.1921, г. Угліч), наватар вытворчасці, лаўрэат Дзярж. прэміі СССР (1970). Чл. КПСС з 1951. Скончыў Энгельскі маш.-буд. тэхнікум (1949). Удзельнік Айч. вайны. На Мінскім аўтазаводзе з 1949, з 1960 нач. кузаўнога цэха. Дзярж. прэмія СССР прысуджана за ўдзел у стварэнні канструкцыі уніфікаванай сям'і высокапрадукцыйных вялікагрузных транспартных аўтамабіляў, аўтапаяздоў і аўтасамазвалаў МАЗ-500 і арг-цыю іх вытворчасці.

КАДЫФІКА́ЦЫЯ (ад *кодэкс*+ лац. facio раблю), вышэйшая форма сістэматызацыі заканадаўства, пры якой выключаюцца ўстарэлыя прававыя нормы, ліквідуюцца супярэчнасці, пропускі і ствараецца адзіны сістэматызаваны заканадаўчы акт — кодэкс. Робіцца па асобных галінах права. Гл. *Сістэматызацыя дзейных законаў*.

КАДЭІН, лякарства, якое супакойвае кашаль. Гл. ў арт. *Алкалоіды*.

КАДЭ́НЦЫЯ (італьян. cadenza ад лац. codo падаю, заціхаю), 1) гарманічны або мела-

дычны зварот, якім завяршаецца муз. думка (увесь твор, яго частка, асобная пабудова). Наз. таксама кадансам. З'яўляецца сродкам выразнага расчлянення муз. мовы. Тыпы К., умовы ўжывання, нормы голасавядзення ў іх вывучае гармонія. 2) У інстр. канцэрце — віртуозны эпізод імправізац. складу, які выконваецца салістам без аркестравага суправаджэння. Спачатку імправізаваліся выканаўцамі. Першым дакладна выпісваць К. пачаў Л. Бетховен.

КАДЭТЫ (канстытуцыйна-дэмакратычная партыя, к.-д., партыя «Народнай свабоды»), галоўная контррэвалюц. партыя ліберальна-манархічнай буржуазіі ў Расіі.

Утворана ў 1905 на базе ліберальна-бурж. «Саюза вызвалення» і «Саюза земцаў-канстытуцыяналістаў». Лідэры П. М. Мілюкоў, В. А. Маклакоў, А. І. Шынгароў, П. Б. Струве, І. І. Петрункевіч і інш. У 1906—07 да 100 тыс. чл. Праграма К. патрабавала канстытуцыйнай манархіі з урадам, адказным перад парламентам; прызнавала магчымым павялічыць сялянскія падзелы за выкуп, пры захаванні памешчыцкага землеўладання; для рабочых — па магчымасці, 8-гадзінны рабочы дзень; па нац. пытанні — культурна-нац. самавызначэнне народнасцей, аўтаномія Польшчы і Фінляндыі; мясцовае самакіраванне. Да рэвалюцыі К. ставіліся варожа, ажыццяўіць праграму намерваліся парламенцкім шляхам у згодзе з царызмам. *Маніфест 17 кастрычніка 1905* задаволіў паліт. імкненні К. У Дзярж. думе фракцыя К. у саюзе з *акцябрыстамі* выступала супраць любых спроб скарыстаць думскую трыбуну для рэвалюц. агітацыі. Пасля Лют. рэвалюцыі 1917 і пяўдалай спробы выратаваць манархію К. ўключылі ў праграму лозунг рэспублікі і занялі кіруючае становішча ў *Часовым урадзе*. Праводзілі імперыял. знешнюю і контррэвалюц. ўнутр. палітыку, патхняльнікі і ўдзельнікі *карнілаўшчыны*. У. І. Ленін і бальшавікі паслядоўна выкрывалі контррэвалюц. сутнасць К. Пасля Кастр. рэв. К.— гал. арганізатары барацьбы супраць Сав. улады. Дэкрэтам ад 28.11(11.12).1917 СНК РСФСР абвясціў К. партыяй ворагаў народа. Як паліт. арг-цыя К. перасталі існаваць у сярэдзіне 20-х г.

На Беларусі групы К. існавалі ў 1906 у Магілёве, Пінску, але распаліся. У час выбараў у 1-ю Дзярж. думу многія землеўладальнікі, гарадская буржуазія і бурж. інтэлігенцыя падзялялі праграму К., яе прапагандавалі газ. «Витебская жизнь», «Могилевский голос», «Новая заря», «Свободное слово» (Вільня).

Літ.: Ленін У. І. Тв. [гл. Даведачны т., ч. 1 (Справочный т. к Полн. собр. соч., ч. 1)].

М. В. Віч. Мінск.

КАДЭЦКІ КОРПУС (франц. cadet малодшы), закрытая навучальна-выхаваўчая ўстанова, дзе рыхтавалі пераважна дзяцей афіцэраў для афіцэрскай службы ці да паступлення ў афіцэрскія школы. У Расіі існавалі з 1732 да 1917, на Беларусі былі ў Полацку, Брэсце.



КАЖАДУБ Іван Мікітавіч (н. 8.6.1920, в. Абражэеўка Глухаўскага пав. Чарнігаўскай губ.), савецкі ваенны дзеяч, ген.-палк. авіяцыі (1970), тройчы Герой Сав. Саюза (люты, жн. 1944, 1945). З сялян. Чл. КПСС з 1943. Скончыў Ваен.-паветр. акадэмію імя Жукоўскага (1949), Ваен. акадэмію Ген. штаба (1956). У Чырв. Арміі з 1940. У Айч. вайну на Варонежскім, Сцяпным, 2-м Укр. і 1-м Бел. франтах — пілот, камандзір звяна, эскадрыллі, нам. камандзіра палка. Адзін з таленавітых лётчыкаў сав. авіяцыі, якія распрацавалі новыя прыёмы паветр. бою. Зрабіў 330 баявых вылетаў, удзельнічаў у 120 паветр. баях, збіў 62 варожыя самалёты. З 1956 на адказнай рабоце ў ВПС. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР 2—5-га скл. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 8 іншымі ордэнамі, медалямі, ордэнамі замежных краін.

Тв.: Служу Родине, М.— Л., 1949.

КАЖАМЯКІН Аляксандр Дзмітрыевіч [н. 7(19).8.1899, в. Дзям'янкі Гомельскага пав. Магілёўскай губ.], гасп. дзеяч, Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1927. Удзельнік грамадз. і Айч. войнаў. У 1937—39 старшыня калгаса «Праўда» Слуцкага р-на Мінскай вобл. У 1944—53 на сав. рабоце: старшыня Барысаўскага, Рудзенскага райвыканкомаў, нам. старшыні Барысаўскага гарвыканкома. З 1954 старшыня калгаса імя Чкалава Барысаўскага р-на Мінскай вобл. Дэп. Вярх. Савета БССР 5-га скл. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, ордэнам Айч. Вайны 1-й ступені, медалямі.

Літ.: Ражкоў М. Д. На крутым уздыме, Мн., 1959.

КАЖАМЯКІН Пётр Паўлавіч [н. 14(27).6. 1917, в. Ізосімкіна Каінскага пав. Томскай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1942. У Чырв. Арміі з 1941. Вызначыўся ў Мінскай і Гродзенскай абл. 1.7.1944 узвод сапёраў на чале з сяржантам К. пад варожым агнём наладзіў пераправу цераз Бярэзіну каля в. Навасёлкі Барысаўскага р-на; 15.7.1944 — цераз Нёман каля Гродна. Жыве ў г. Чулым Новасібірскай вобл.

КАЖАМЯКІНА, вёска ў Гарадзецкім с/с Краснапольскага р-на Магілёўскай вобл., каля р. Тур'я. Цэнтр калгаса «Новы шлях». За 7 *км* на Пн ад Краснаполля, 116 *км* ад Магілёва, 64 *км* ад чыг. ст. Крычаў 1-ы, на аўтамаб. дарозе Краснаполле — Магілёў. 178 ж., двароў 60 (1971). Лясніцтва. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. У кастр. 1943 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі. Мемарыяльная дошка на ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

КАЖАН-ГАРАДОК, вёска ў Лунінецкім р-не Брэсцкай вобл., на левым беразе р. Цна. Цэнтр Гарадоцкага с/с і калгаса «Маяк камунізма». За 18 *км* на ПдУ ад Лунінца. 267 *км* ад Брэста, 7 *км* ад чыг. ст. Лахва, на аўтамаб. дарозе Лунінец — г. п. Мікашэвічы. 2416 ж., гасп. 656 (1971). Філіял Лунінецкага камбіната быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, Дом культуры, 2 б-кі, бальніца, аптэка, аддз. сувязі, 3 магазіны. У кастр. 1942 ням.-фаш. захопнікі спалілі 100 дамоў, загубілі 975 сав. грамадзян. Помнік сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну. Помнік драўлянага дойлідства — *Кажан-Гарадоцкая Мікалаеўская царква* пач. 19 ст.

КАЖАН-ГАРАДОЦКАЯ МІКАЛАЕЎСКАЯ ЦАРКВА, помнік драўлянага дойлідства пач. 19 ст. Пабудавана ў в. Кажан-Гарадок (Лунінецкі р-н Брэсцкай вобл.) у 1818. Пяцізрубны, пяцікупальны, пірамідальны па кампазіцыі цэнтрычны храм з званіцаю над уваходам. Зрубы пастаўлены па крыжы плана. Цэнтрычную будову падкрэслівае сярэдні зруб, які вылучаецца аб'ёмам, вышынёй і памерам купала. Вакол яго сіметрычна згрупаваны 4 невял. вежы з прыгожымі купалкамі. Царква вызначаецца прастатою вонкавага аблічча будынка і пышным убраннем інтэр'ера (многа разьбяных драўляных скульптур, багаты арх. дэкор). *У. А. Чантурыя.* Мінск.





Кажан - Гарадоцкая Мікалаеўская царква. Агульны выгляд і план.

КАЖАНЫ (Vespertilio), род млекакормячых сям. гладканосых падатр. лятучых мышэй атр. рукакрылых. Каля 20 відаў у Еўропе і Азіі. У СССР 11 відаў, на Беларусі 5.

Найб. вядомыя ў рэспубліцы 3 віды. Нетапыр-карлік (V. pipistrellus) — даўж. цела калля 40 *см*, поўсць цёмна-карычневая; жыве калоніямі (па 100 і больш асобін), вельмі пашыраны ў вах. абласцях БССР. Лясны нетапыр (V. nathusii) — даўж. цела да 50 *см*, поўсць цёмна-карычневая з бляскам; пашыраны пераважна ва ўсх. абласцях рэспублікі. Двухкаляровы кажан (V. murinus) — цела даўж. да 60 *см*, укрытае доўгай мяккай серабрыстаю поўсцю, па Беларусі жыве летам, увосень пераляцае ў Аўстрыю і Румынію. К. селяцца ў месцах, звязаных з жыллём чалавека. Кормяцца паслякомымі, большасць з якіх шкодзяць лесу, с.-г. раслінам, жывёлам і чалавеку. Іл. гл. ў арт. *Лятучыя мышы.*

А. М. Курскоў. Мінск.

КАЖУХ, верхняе зімовае (мужчынскае і жаночае) адзенне з аўчын. Пашыраны ў многіх народаў, асабліва ўсх. славян. У кроі К. вылучаюцца тры тыпы: прамы, у талію, з «вусам». У беларусаў найболей вядомы К. прамога крою: спінка і пярэдняе крыссе прамыя, вялікі адкладны каўнер.

Крой у талію — спінка фігурная, адразная па лініі талii, ніжняя пашыраная частка ў зборку. Пярэдняе адразное крыссе прамое. Каўнер адкладны. Правае крысо, ніз і рукавы абшываюцца палоскаю аўчыны воўнаю наверх. На Пд Беларусі былі пашыраны К. крою з «вусам»: спінка суцэльная, у талii звужвалася, а па баках ад лініі талii ўшываліся шырокія клiны — «вусы». Каўнер маленькі, стаячы. Клiны і каўнер абшываліся розначаляроваю жычкаю.



На пач. 30-х г. 20 ст. К. з «вусам» — рэдкая з'ява. *Г. М. Курыловіч.* Мінск.

КАЖУХОЎ Васіль Мікалаевіч (1907, в. Мельень Мінскай губ.— 10.7.1939), Герой Сав. Саюза (1939). Удзельнік баёў супраць яп. захопнікаў на Халхін-Голе (жн. 1939) — ст. лейтэнант, камандзір стралковага батальёна. Пад камандаваннем К. воіны падраздзялення ў час атакі знішчылі 300 салдат і афіцэраў, захапілі 6 аўтамашын. Загінуў у баі.

КАЖУШКА Леанід Іванавіч (н. 17.6.1923, ст. Яршоў Самарскай губ.), наватар вытворчасці, лаўрэат Дзярж. прэміі СССР (1970). Чл. КПСС з 1943. Удзельнік Айч. вайны. Скончыў Мінскі аўтамеханічны тэхнікум (1949). На Мінскім аўтазаводзе з 1946. У 1959—66 нач. вытворчасці з-да, з 1966 нам. дырэктара па агульных пытаннях. Дзярж. прэмія СССР прысуджана за ўдзел у стварэнні канструкцыі уніфікаванай сям'і высокапрадукцыйных вялікагрузных транспартных аўтамабіляў, аўтапаяздоў, аўтасамазвалаў МАЗ-500 і арг-цыю іх вытворчасці. Узнаг. 4 ордэнамі, медалямі.

КАЖУШКІ, вёска ў Хойніцкім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса імя XXII з'езду КПСС. За 30 *км* на ПдЗ ад Хойнікаў, 133 *км* ад Гомеля, 33 *км* ад чыг. ст. Хойнікі, 5 *км* ад прыстані Ламачы на Прыпяці. 987 ж., двароў 273 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. У маі 1943 вёску спалілі ням.-фаш. захопнікі, загубілі 92 мірных жыхароў.

КАЖУШКІН Мікалай Аляксеевіч (н. 16.10. 1922, хут. Кузькін Хапёрскай акр. Царыцынскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1952. У Чырв. Арміі з 1941. Вызначыўся ў Беларускай аперацыі 1944. Лётчык К. зрабіў 112 баявых вылетаў, знішчыў 14 танкаў, 3 гарматы, 21 аўтамашыну, 4 зенітныя батарэі, заглушыў агонь каля 40 кропак зенітнай артылерыі ворага. Жыве і працуе ў Гомелі.

КАЖЫНСКІ (Każyński) Мацей (1767—18.3. 1823), польскі спявак, акцёр, рэжысёр і антрэпрэнёр. Стваральнік першага пастаяннага т-ра ў Мінску (на польскай мове). Акцёрскую дзейнасць пачаў у Любліне (1786). У 1793 працаваў у Гродне. Выконваў камед. ролі ў п'есах Мальера, В. Багуслаўскага, Ф. Багамольца. Антрэпрэнёр, рэж. і акцёр Мін-



скага (1797—1801, 1802—05) і Віленскага (1801—02, 1805—16) т-раў. Гастраляваў з Мінскім т-рам у Полацку, Віцебску, Хотаве, Бешанковічах (1805) і ў Маскве (1797, 1805), з Віленскім т-рам — у Мінску і ў Пецярбурзе (1807).

Г. І. Барышаў. Мінск.

КАЖЭЎНІКАЎ Вадзім Міхайлавіч [н. 9(22).4.1909, г. Нарым], рускі савецкі пісьменнік. Чл. КПСС з 1943. Скончыў Маскоўскі ун-т (1933). З 1949 гал. рэдактар час. «Знамя». Друкуецца з 1928. Зб. апавяданняў «Начная размова» (1939), аповесць «Вялікі заклік» (1940) паказваюць падзеі грамадз. вайны. Аб гераізме сав. народа ў Айч. вайну пісаў у «Апавяданнях пра вайну» (1942), апавяданні «Сакавік — красавік» (1942), зб. апавяданняў «Любімыя таварышы» (1943) і інш. Падзеі Кастр. рэв. ў Сібіры — у цэнтры рамана «Зары насустрач» (кн. 1—2, 1956—57). Яркі вобраз камуніста-кіраўніка стварыў у аповесці «Знаёмцеся, Балуеў» (1960). Аўтар рамана пра сав. разведчыкаў «Шчыт і меч» (1965, паст. т-рам імя Я. Коласа 1967). Сакратар СП СССР з 1961. Дзярж. прэмія СССР 1971. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Кастр. Рэв., 4 інш. ордэнамі, медалямі.



Тв.: Собр. соч., т. 1—6, М., 1968—71; бел. пер.— у зб.: Аб капі і конніку, Мн., 1936.

«КАЗА» («хадзіць з казою»), старажытны беларускі народны абрад. Пашыраны па *каляды*. Вядомы і па Украіне, у Расіі.

Кемлівага хлопца апраналі ў вывернуты кажух, надзявалі маску казы, прымацоўвалі рогі. Акцёр, які выконваў ролю «казы», танцаваў і спяваў. Разам з «казою» былі паказы «бусла», «кабылкі» («каня сівога»). «Казе» спадарожнічалі «дзед», «важачы», «цыганкі», «музыкі», «песельнікі». З дазволу гаспадароў яны заходзілі ў хаты і пачынялі паказ, жадалі дабра гаспадарам. Потым іх частавалі. Першыя запісы «казы» з 19 ст. «Каза» ўваходзіла ў паказы *батлейкі* ў сцэне «Антон з казою і Антоніха».

Паказ «казы» (з малюнка мастака Андрыёлі. 2-я пал. 19 ст.).



Літ.: Волошин І. О. Джерела народного театру на Україні, Київ, 1960, с. 95—103; Добровольский В. Н. Смоленский этнографический сборник, ч. 4, М., 1903, с. 8—9; Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного край, т. 1, ч. 1, СПб., 1887, с. 89—98.

С. М. Міско. Мінск.

КАЗАК Іван Пятровіч [н. 2(15).1.1918, в. Паніжаны Мінскага пав.], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Баранавіцкай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1950. Скончыў Рэспубліканскую парт. школу пры ЦК КПБ (1953). З 1937 рабочы мінскага з-да імя Мяснікова. Удзельнік сав.-фінляндскай вайны 1939—40. У партызанах з вер. 1941 — камісар атрада, з ліст. 1942 камісар *партызанскай брыгады імя В. П. Чкалава* Баранавіцкай вобл. Пасля вайны на парт., сав., гасп. рабоце. Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі. Жыве ў Мінску.

КАЗАКЕВІЧ Даніла Васілевіч [н. 3(16).12.1902, в. Радзяўцы Вілейскага пав. Віленскай губ.], генерал-лейтэнант (1967), Герой Сав. Саюза (1945). З сялян. Чл. КПСС з 1925. Скончыў Вышэйшую пагран. школу (1929), Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1937). У Чырв. Арміі з 1920. Удзельнік грамадз. вайны. У Айч. вайну на фронце з сак. 1943 — нач. штаба дывізіі, камандзір дывізіі. Удзельнік баёў на Курскай дузе, вызвалення Бранскай вобл., Беларусі, Польшчы, разгрому ворага ў Германіі. У час Бел. аперацыі 1944 дывізія пад камандаваннем К. прарвала ням.-фаш. абарону на ПнУ ад Рагачова, фарсіравала Друць, Дабасну, Алу і разам з інш. злучэннямі штурмам авалодала Бабруйскам. У 1944 пры прарыве варожай абароны на Нарве паспяхова фарсіравала раку, захапіла плацдарм, адбіла 7 контратак. З 1959 у запасе. Жыве ў Маскве.



КАЗАКЕВІЧ Павел Канстанцінавіч (1904, в. Забашавічы Барысаўскага пав. Мінскай губ.— 15.2.1943), Герой Сав. Саюза (1943). З сялян. Чл. КПСС з 1930. Скончыў Аб'яднаную бел. ваен. школу (1931), Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1939). У Чырв. Арміі з 1926. Удзельнік вызвалення Зах. Беларусі (1939), сав.-фінляндскай вайны 1939—40. У Айч. вайну на Зах., Паўд.-Зах. франтах. Вызначыўся ў лютым 1943 у баях каля Харкава. Полк пад камандаваннем палк. К. перакрыў шашу Любаціч — Палтава і адрэзаў ворагу шляхі адыходу з Харкава, знішчыў больш за 200 аўтамашын. Загінуў у баі.



КАЗАКЕВІЧ Эмануіл Генрыхавіч [11(24).2.1913, г. Крамянчуг — 22.9.1962], рускі савецкі пісьменнік. Чл. КПСС з 1944. Скончыў Харкаўскі машынабуд. тэхнікум (1930). Працаваў нач. буд-ва, старшынёй калгаса, дырэктарам тэатра, журналістам у Бірабіджане. Раннія вершы на яўр. мове (зб. «Вялікі свет», 1939). Першы твор на рус. мове — аповесць «Зорка» (1947, Дзярж. прэмія СССР 1948) пра Айч. вайну. Аўтар аповесцей «Двое ў стэпе» (1948), «Вясна на Одэры» (1949, Дзярж. прэмія СССР 1950), «Сэрца друга» (1953), апавядання «Пры святле дня» (1961). У аповесці «Сіні сшытак» (1961, аднайменны кінафільм 1964) стварыў вобраз У. І. Леніна. Творчасці К. характэрныя вострая маральна-этычная праблематыка, пластычнасць і псіхал. глыбіня характараў. Узнаг. 4 ордэнамі, медалямі.

Тв.: Собр. соч., т. 1—2, М., 1963.

Літ.: Бочаров А. Г. Эммануил Казакевич, М., 1965.

КАЗАКОЎ Аляксандр Апанасавіч [н. 15(28).5.1917, в. Аляксандраўка Мамадышскага пав. Казанскай губ.— 11.7.1950], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1943. У Чырв. Арміі з 1941. Вызначыўся ў чэрв. 1944 у Магілёўскай вобл. Стралк. батальён на чале з К. фарсіраваў р. Проню, каля в. Галовічы прарваў абарону ворага, фарсіраваў Дняпро, захапіў плацдарм, адбіў некалькі варожых контратак.

КАЗАКОЎ Аляксандр Ільіч [н. 28.1(9.2).1900, г. Харкаў — 27.12.1961], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1946). На фронце з 1941, камандзір кулямётнага ўзвода. Вызначыўся 22.7.1944 у баі за в. Рудавец Брэсцкага р-на. Узвод пад камандаваннем К. адбіў 3 контратакі праціўніка; К. знішчыў групу гітлераўцаў гранатамі.

КАЗАКОЎ Васіль Іванавіч [6(18).7.1898, в. Філіпава Княгінінскага пав. Ніжагародскай губ.— 25.5.1968], маршал артылерыі (1955), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). З сялян. Чл. КПСС з 1932. Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1934). У Чырв. Арміі з 1918. У грамадз. вайну ўдзельнічаў у баях супраць белагвардзейцаў і інтэрвентаў пры абароне Петраграда і на Зах. фронце. У Айч. вайну камандаваў артылерыяй Бранскага, Сталінградскага, Данскога, Цэнтр., Бел. і 1-га Бел. франтоў. Удзельнік абароны Масквы, баёў пад Сталінградам, Курскам, вызвалення Варшавы, штурму Берліна. Пасля вайны камандуючы артылерыі Групы сав. войск у Германіі, пам. і камандуючы артылерыі Сав. Арміі, камандуючы ракетных войск, у Міністэрстве абароны СССР. Дэп. Вярх. Савета СССР 2-га скл. Узнаг. 4 ордэнамі Леніна, 11 інш. ордэнамі, медалямі.



КАЗАКОЎ Канстанцін Фёдаравіч (1906, с. Пачэлма Ніжне-Ломаўскага пав. Пензенскай губ.— 1951), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). На фронце з 1942, камандзір стралк. аддзялення. Вызначыўся ў Гомельскай вобл. Пад варожым агнём з групай байцоў пераправіўся цераз Дняпро каля Лоева, выбіў ворага з траншэяў, заняў выгадны рубеж і гэтым забяспечыў пераправу батальёна.

КАЗАКОЎ Мацвей Фёдаравіч [1738, Масква — 26.10(7.11).1812], рускі архітэктар. Адзін з заснавальнікаў і галоўны прадстаўнік класіцызму ў рускай архітэктуры 18 ст. Вучыўся ў арх. школе Дз. Ухтамскага (1751—60). У 1763—67 працаваў у Цверы, у 1768—74 памагаў В. Бажэнаву ў праектаванні Вял. Крамлёўскага палаца ў Маскве. У пабудовах К. арганічна спалучаліся шырыня горадабудаўнічых задач, рацыянальнасць канструктыўнай будовы і ўзвышанасць арх. вобраза. Упершыню ў Расіі распрацаваў і ажыццявіў канструкцыі купалоў вялікага дыяметра для палацавых і грамадскіх збудаванняў. Сярод работ: Сенат (будынак урада СССР у Крамлі; 1776—87), універсітэт (1782—93, пасля пажару 1812 перабудаваны Дз. Жылярдзі), Галіцынская бальніца (1796—1801), дамы-сядзібы Дзямідава (1789—91), Губіна (90-я г.), ц. Піліпа Мітрапаліта (1777—88), ц. Ушэсця (1790—93; усе ў Маскве). У пабудовах рамант. кірунку К. пакідаў класічную аснову, выкарыстоўваючы дэкар. элементы стараж.-рус. архітэктуры для аздаблення фасадаў (Пятроўскі палац у Маскве, 1775—82; Палац у Царыцыне, 1786—95). Выдатны майстар інтэр'ера: зала шляхетнага сходу (Калонная зала Дома Саюзаў), «залатыя пакоі» дома Дзямідава. У 1800—04 кіраваў складаннем планаў Масквы, стварыў серыі арх. альбомаў. Працаваў таксама ў графіцы. У 1792 арганізаваў арх. школу пры Экспедыцыі крамлёўскага будавання.



Літ.: Власюк А. И., Каплун А. И. и Кипарисова А. А. Казаков, М., 1957; Ильин М. А. Казаков, М., 1955.

КАЗАКОЎ Мікалай Якаўлевіч [н. 13(26).11.1912, с. Верхапенне Абаянскага пав. Курскай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). Чл. КПСС з 1943. На фронце з 1941. Вызначыўся ў вер. 1943 ў Камарынскім р-не Палескай вобл. У цяжкі момант бою сакратар камсамольскай арг-цыі палка К. асабістым прыкладам натхніў байцоў, павёў іх у атаку і выбіў ворага з в. Чыкалавічы. Жыве ў Рызе.

КАЗАКОЎ Сцяпан Аляксандравіч [7(20).4.1914, в. Мала-Наватроіцк Бірскага пав. Уфімскай губ.— 8.12.1964], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943).

Чл. КПСС з 1942. У Чырв. Арміі з 1938, на фронце з 1941. Вызначыўся ў Камарынскім р-не Палескай вобл. 27.9.1943 пераправіўся на заняты ворагам бераг Дняпра і карэкціраваў агонь свайго дывізіёна, памог знішчыць 2 артыл. батарэі і 5 кулямётаў ворага, чым садзейнічаў пераправе часці.

КАЗА́ЛЬС Пабла, іспанскі віяланчэліст. Гл. *Касальс П.*

КАЗА́НАЎ Сардзіён Давыдавіч [н. 1(14).1.1911, с. Сукнаід-Убань Ахалцыхскага пав. Тыфліскай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). Чл. КПСС з 1944. На фронце з 1941. Вызначыўся ў Лоеўскім р-не Гомельскай вобл. Аддзяленне кулямётнай роты на чале з К. пераправілася цераз Дняпро, выбіла ворага з траншэй і агнём з кулямёта прыкрывала пераправу батальёна. 17—18.10.1943 пры вызваленні в. Бывалькі байцы аддзялення адбілі некалькі варожых контратак.

КАЗА́НСК, вёска ў Казловіцкім с/с Калінкавіцкага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр калгаса «Сейбіт». За 36 *км* на Пн ад Калінкавіч, 158 *км* ад Гомеля, 12 *км* ад чыг. ст. Халоднікі, каля аўтамаб. дарогі Бабруйск — Мазыр (3 *км*). 560 ж., дваро́ў 184 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Помнік на брацкай магіле 136 сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны.

КАЗА́НСКАЕ ХА́НСТВА (1438—1552), феад. дзяржава, якая ўзнікла на тэр. *Балгарыі Волжска-Камскай* пасля распаду *Залатой Арды*.

У К. х. ўваходзілі Сярэдняе Паволжа, ніжняя Кама і Вятка, ч. Башкірыі. Сталіца Казань. Насельніцтва — татары, мары, удмурты, чувашы, башкіры. Гал. занятак — аселае земляробства, у башкіраў — вандроўная жывёлагадоўля. Большасць насельніцтва — вольныя сяляне, якія плацілі ясак і інш. падаткі дзяржаве і феадалам; былі феадальна-залежныя сяляне, прыгонныя з ваеннапалонных (у 16 ст. ў К. х. каля 100 тыс. рус. палонных), рабы. Панавала феад. раздробленасць. Улада належала хану, дзейнасць якога накіроўваў савет буйных феадалаў (дыван). Армія складалася з ханскай гвардыі, атрадаў феадалаў, апалчэння ясачных людзей (да 60 тыс. чал.). К. х. праводзіла палітыку захопу чужых тэрыторый, часта нападала на рус. землі. З 1487 К. х. пад уплывам Русі, што садзейнічала развіццю гандлю, эканам. і культ. сувязей народаў Сярэдняга Паволжа і Русі. У 1521 уладу ў К. х. захапіла варожая Маскве феад. групоўка, якая арыентавалася на Крым і Турцыю. Аднавіліся набегі на рус. землі. У выніку паходаў войск Івана IV 1545—52 К. х. далучана да Расіі.

Літ.: История Татарской АССР, т. 1, Казань, 1955; Сафаргалиев М. Г. Распад Золотой Орды, Саранск, 1960. *А. П. П'янкоў.* Мінск.

«КАЗА́НСКАЯ ЗМО́ВА», спроба падняць ваенна-сялянскае паўстанне ў Паволжы, каб падтрымаць паўстанне 1863—64 у Польшчы, Літве і на Беларусі. Акрамя польскіх і літ.-бел. паўстанцкіх цэнтраў у «К. з.» ўдзельнічалі або мелі да яе дачыненне пецярбургская, маскоўская, казанская арг-цыі «Зямлі і волі», афіцэрскія і студэнцкія гурткі ў розных гарадах Расіі.

У ўдзельнікаў «К. з.» выявіліся разыходжанні у ацэнцы гатоўнасці рус. сялян да паўстання і у метадах работы сярод іх. Падложны царскі маніфест і адозву ад неіснуючага «Часовага нар. праўлення» (31.3.1863) з заклікам да народа неадкладна браць уладу ў свае рукі казанскія землявольцы адмовіліся распаўсюджваць і склалі сваю праклямацыю аб падрыхтоўцы да арганізаванага паўстання. «К. з.» раскрыта ў крас. 1863. Галоўны польскі прадстаўнік І. Кеневіч, афіцэры Н. Іваніцкі, А. Мрочак, Р. Станкевіч расстраляны ў чэрв. 1864. Адзін з кіраўнікоў афіцэр М. А. Чарняк схоплены пазней і расстраляны ў Казані ў кастр. 1865. Астатнія прыгавораны да турэмнага зняволення і катаржных работ.

Літ.: Лейкина-Свирская В. Р. «Казанский заговор» 1863 г., у кн.: Революционная ситуация в России в 1859—1861 гг., М., 1960; Козьмин В. П. Казанский заговор 1863 года, М., 1929. *Г. В. Кісялёў.* Вільнюс.

КАЗА́НСКІ Барыс Аляксандравіч [н. 13(25).4.1891, Адэса], савецкі хімік-арганік. Акад. АН СССР (1946, чл.-кар. 1943). Герой Сац. Працы (1969). Праф. Маскоўскага ун-та (з 1935), адначасова (з 1936) працуе ў Ін-це арган. хіміі АН СССР (1954—66 дырэктар). Асн. кірунак даследаванняў К.: заканамернасці каталітычнага гідрагенолізу цыклічных вуглевадародаў з малымі, сярэднімі і вялікімі цыкламі; рэакцыі C_5- і C_6-дэгідрацыклізацыі парафінаў у прысутнасці металічных каталізатараў; стадыйны механізм араматызацыі парафінаў на вокісных і платформінгавых каталізатарах; далучэнне вадароду да алкенаў і алкадыенаў на металах VIII гр. і спадарожныя гэтаму рэакцыі; даследаванне саставу бензінаў прамой гонкі. Дзярж. прэмія СССР 1949. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі.



Тв.: Каталитические превращения углеводородов. Сб. избр. тр., М., 1968.

Літ.: Борис Александрович Казанский, М., 1952 (Материалы к биобиблиографии ученых СССР).

КАЗА́НСКІ Віктар Мікалаевіч [17(30).9.1903, Магілёў — 17.8.1963], удзельнік грамадз. вайны, ген.-м. (1945). З служачых. Чл. КПСС з 1932. Скончыў кав. школу (1926). У кастр. 1917 — маі 1918 у чырвонагвардз. партыз. атрадзе, у Чырв. Арміі з 1918. У 1918—23 на Зах. фронце ваяваў супраць польскіх інтэрвентаў і на Туркестанскім — супраць басмацтва. У Айч. вайну на Зах. і 1-м Бел. франтах — нач. забеспячэння кав. групы Л. М. Даватара, нам. камандзіра дывізіі, корпуса па тыле. Удзельнік абароны Масквы, баёў пад Сталінградам, вызвалення Польшчы, штурму Берліна. З 1946 на гасп. рабоце. З жн. 1953 у запасе. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, 6 інш. ордэнамі, медалямі, ордэнамі ПНР.

КАЗА́НСКІ УНІВЕРСІ́ТЭТ імя У. І. Ульянава-Леніна, вышэйшая навучальная ўстанова. Засн. ў Казані ў 1804. Імя У. І. Ульянава-Леніна прысвоена ў 1925.

Сярод супрацоўнікаў і выхаванцаў ун-та вядомыя дзеячы навукі, л-ры, мастацтва: М. І. Лабачэўскі (праф. і рэктар ун-та ў 1827—46), С. Ц. Аксакаў, М. М. Зінін, А. М. Бутлераў, І. М. Сіманаў, М. В. Ляпуноў, М. А. Кавальскі і інш. Дзейчым ун-та належаць навук. адкрыцці сусв. значэння ў галіне матэматыкі, хіміі, фізікі, астраноміі і інш. навук. У 1887 на юрыд. ф-т паступіў У. І. Ульянаў-Ленін, але хутка быў выключаны з ун-та за ўдзел у студэнцкіх хваляваннях і высланы пад нагляд паліцыі.



Будынак Казанскага універсітэта імя У. І. Ульянава-Леніна.

Ф-ты ў 1970/71 навуч. г.: гісторыка-філал., юрыд., механіка-матэм., фізічны, хім., біёлага-глебавы, геал., геаграфічны. Навучанне дзённае, вячэрняе і завочнае. Есць аспірантура. Прымае да абароны канд. і доктарскія дысертацыі. Пры ун-це хім. і механіка-матэм. НДІ, вылічальны цэнтр, 2 астранам., магнітная і метэаралаг. абсерваторыі, заалаг. і біял. станцыі, заалагічны, этнаграфічны музеі, навук. б-ка. Адкрыты музей У. І. Ульянава-Леніна. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга (1955). Выдае «Вучоныя запіскі» (з 1821).

М. Ц. Нужын. Казань.

КАЗА́НЬ, горад, сталіца Татарскай АССР, вялікі прамысловы, навуковы і культурны цэнтр СССР. Порт на левым беразе Волгі. Чыг. вузел, аэрапорт. 885 тыс. ж. (1971). Найб. развіта прамысловасць хімічная (з-ды арган. сінтэзу, хім., фармацэўтычны, па вытворчасці сінт. каўчуку і інш.), машынабудаўнічая (з-ды па вытв. с.-г. абсталявання, канцылярскіх пішучых прылад, абсталявання для канатна-падвесных дарог, кампрэсарны, мед. апаратуры і інш.), лёгкая (камбінаты: абуткоўны, футравы, валюшна-лямцавы, ільнокамбінат), харчовая. Тлушчавы камбінат (выпускае стэарын, гліцэрыну, мыла). Прадпрыемствы буд. матэрыялаў. 10 ВНУ, у т. л. *Казанскі універсітэт*. 17 сярэдніх спец. навуч. устаноў. 5 тэатраў (татарскі оперы і балета, татарскі драм., рус. драм., юнага гледача, лялечны), філармонія. Дзярж. музей Татарскай АССР, музей выяўл. мастацтваў. Дом-музей У. І. Леніна, Дом-музей М. Горкага.

К. узнікла ў 2-й пал. 13 ст. за 45 *км* ад вусця р. Казанкі. У канцы 14 ст. перанесена на месца сучаснай К. У 15—16 ст. сталіца *Казанскага ханства*, якое ў 1552 далучана да Расіі. З 1708 цэнтр Казанскай губ. Эканам. развіццё К. паскорылася з пабудовай у пач. 18 ст. Сібірскага тракту. У час сялянскай вайны пад кіраўніцтвам Е. І. Пугачова 1773—75 большая ч. Казані спалена (ліп. 1774). З 2-й пал. 19 ст. К.— адзін з цэнтраў рэвалюц. руху ў Расіі. Тут пачынаў рэвалюц. дзейнасць У. І. Ленін. Сав. ўлада ўстаноўлена 26.10(8.11).1917. У жн. 1918 захоплена белагвардзейцамі, 10.9.1918 вызвалена Чырв. Арміяй. З 27.5.1920 — сталіца Тат. АССР.

Літ.: Бобченко Т., Гарзавина А. и Синицына К. Казань. Путеводитель, Казань, 1970.

КАЗАРА́Н Андранік Абрамавіч [н. 1(14).5.1904, Баку], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). Чл. КПСС з 1927. У Чырв. Арміі з 1920, на фронце з 1941. Вызначыўся ў Камарынскім р-не Палескай вобл. Дывізія на чале з К. у вер. 1943 фарсіравала Дняпро, захапіла плацдарм і ў цяжкіх баях расшырыла яго, знішчыла шмат варожай тэхнікі і жывой сілы. Жыве ў Сімферопалі.

КАЗА́РКІ (Branta), род вадаплаўных птушак сям. качыных атр. гусепадобных. 3 віды: чорная К. (B. bernicla), белашчокая К. (B. leucopsis) і канадская К. (B. canadensis). Пашыраны на Пн Еўропы, Азіі і Амерыкі. На Беларусі чорная К. (невялікая чорна-шэрая гусь; пападаецца на вясновым і асеннім пералётах).

Даўж. цела К. да 90 *см*, маса 1,1—2,25 (канадская К. да 8) *кг*. Галава маленькая, дзюба кароткая, чорная, лапы чорныя. Жывуць К. на берагах арктычных мораў, а-вах Ледавітага і Ціхага ак. Добра ходзяць, плаваюць, не ныраюць. Гнёзды робяць на вямлі. Нясуць 3—5 яец. Кормяцца расліннамі. У час лінькі збіраюцца вял. чародамі. Некат. аўтары да роду К. адносяць і чырвонаваллёвую К.



Чорная (злева) і чырвонаваллёвая казаркі.

(Rufibrenta ruficollis), іншыя лічаць яе самастойным родам. Маса да 1 *кг*. Апярэнне стракатае. У склад бел. арнітафаўны ўключана ў 1965, калі параненую птушку злавілі на Мінскім моры.

Літ.: Птицы Советского Союза, т. 4, М., 1952; Федюшин А. В. и Долбик М. С. Птицы Белоруссии, Мн., 1967 (бібліягр.).

Р. К. Кажэўнікава. Мінск.

КАЗА́РСКІ Аляксандр Іванавіч [1798, мяст. Дуброўна Беларускай губ. — 16(28).6.1833], герой руска-турэцкай вайны 1828—29. З сям'і чыноўніка. Скончыў Мікалаеўскае штурманскае вуч. (1813). 14(26).5.1829 у час разведкі каля Басфора брыг «Меркурый» на чале з К. сустрэўся з 2 тур. караблямі, якія больш як у 10 разоў пераўзыходзілі яго баявую магутнасць, і прыняў бой (працягваўся 4 гадзіны і скончыўся перамогай «Меркурыя»). Узнаг. ордэнам Георгія 4-га класа. У Севастопалі К. пастаўлены помнік (1834) з надпісам: «Казарскаму. Патомству ў прыклад».

Літ.: Стваліński Ю. Patomstwu ў prykład, «Віцебскі рабочы», 1956, № 71, 8 крас., № 74, 13 крас., № 77, 17 крас.; Военный энциклопедический лексикон..., т. 6, 2 изд., СПб., 1854, с. 404—406.

М. І. Каміньскі. Мінск.

КАЗАРЭЗАЎ Андрэй Акімавіч (н. 26.10.1918, в. Астанкава Курскага пав.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). Чл. КПСС з 1943. Камандзір агнявога ўзвода К. вызначыўся каля Лоева Гомельскай вобл. 15.10.1943 артыл. разлік на чале з К. фарсіраваў Дняпро і агнём гарматы падтрымаў наступленне пяхоты. Жыве ў Маскве.

КАЗА́ХІ (саманазва к а з а к, к а з а х), нацыя, карэннае насельніцтва Казахскай ССР (29,8%). Жывуць таксама ў рэспубліках Сярэдняй Азіі, у РСФСР. За межамі СССР — у Сіньцзян-Уйгурскім аўт. раёне КНР і ў зах. частцы МНР. Паводле перапісу 1970 агульная

колькасць К. у СССР 5299 тыс. чал., гавораць на *казахскай мове*. Веруючыя К.— мусульмане-суніты.

Асновай каз. народнасці былі шматлікія цюркаі манголамоўныя плямёны, аб'яднанне якіх закончылася ў асн. у 15—16 ст. З сярэдзіны 18 да 2-й пал. 19 ст. адбывалася добраахвотнае далучэнне Казахстана да Расіі. Яно мела станоўчую ролю ў эканам. і культ. развіцці К. Працэс кансалідацыі К. у бурж. нацыю адбыўся ў канцы 19 — пач. 20 ст.

Пры Сав. уладзе К. перайшлі да аселасці, змяніліся іх культура і побыт. Нац. адзенне К. у мінулым: мужчыны насілі камзол і халат, надзявалі іх на споднюю сарочку і шырокія нагавіцы; жанчыны — безрукаўкі наверх на доўгія кашулі-сукенкі. Верхняе цёплае адзенне — кажух з аўчын — насілі і летам. У К. бытавалі дзве формы жылля — качавая юрта і зімовае жыллё — пабудовы з саману ці дзёрну або плеценыя і абмазаныя глінаю. Цяпер К. жывуць у сучасных дамах, вопратка гарадскога крою, выцясняе старыя формы адзення. Пра гісторыю, гаспадарку і культуру казахаў гл. ў артыкуле *Казахская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка*.

Дз. Д. Супрун. Мінск.

КАЗАХСКАЯ МОВА, мова *казахаў*, карэннага насельніцтва Казахскай ССР. Належыць да кыпчацкай групы *цюркскіх моў*. У СССР на К. м. гавораць каля 5193 тыс. чал.

Вылучаюць 3 дыялекты: паўн.-усх. (аснова літ. мовы), паўд. і заходні, адрозненні паміж імі невялікія. Характ. асаблівасці К. м.: гармонія галосных, наяўнасць дыфтонгаў; грамат. будова аглюцінатыўная, часціны мовы дыферэнцыяваны невыразна, вялікая роля паслялогаў. Літ. К. м. узнікла ў 2-й палове 19 ст. На пачатку К. м. выкарыстоўвала арабскі алфавіт, з 1938 пісьменнасць на аснове рус. графікі.

Літ.: Балакаев М. Б. Современный казахский язык. Синтаксис словосочетания и простого предложения, Алма-Ата, 1959; Современный казахский язык. Фонетика и морфология, Алма-Ата, 1962; Сарыбаев Ш. Ш. Библиографический указатель литературы по казахскому языкознанию, ч. 1, 2 изд., Алма-Ата, 1965.

КАЗАХСКАЯ САВЕЦКАЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ РЭСПУБЛІКА (Казакстан Саветык Сацыялістык Рэспублікасы), Казахстан.



Утворана 5.12.1936. Размешчана пераважна ў Азіяцкай ч. СССР. Пл. 2715,1 тыс. км². Нас. 12 850 тыс. чал. (1970). Сталіца Алма-Ата. У складзе рэспублікі 17 абласцей (гл. табл. 1 і адпаведныя арт. пра кожную вобласць), 78 гарадоў, 172 гар. пасёлкі. [На ўклейках: фіз. карта, ілюстрацыі да раздзелаў Прырода (I), Нар. гасп. (I), Архітэктура, Выяўл. мастацтва (II).]

Дзяржаўны лад. Каз. ССР — саюзная савецкая сацыяліст. рэспубліка. Уваходзіць у склад СССР на аснове добраахвотнасці і раўнапраўя. Канстытуцыя прынята Надзвычайным X з'ездам Саветаў рэспублікі 26.3.1937. Уся ўлада ў рэспубліцы належыць працоўным горада і вёскі ў асобе Саветаў дэпутатаў працоўных. Вышэйшыя органы дзярж. улады — Вярх. Савет, які выбіраецца на 4 гады, а ў перыяд паміж сесіямі — Прэзідыум Вярх. Савета. Вышэйшы выканаўча-распарадчы орган — Савет Міністраў. Мясц. органы дзярж. улады — абласныя, раённыя, гарадскія, пасялковыя Саветы дэпутатаў працоўных. Суд. сістэма: Вярх. суд Каз. ССР, абл. і раённыя нар. суды. Каз. ССР мае свой дзярж. герб, флаг і гімн.

Табліца 1

Адміністрацыйны падзел Казахскай ССР

Вобласці	Плошча, тыс. км²	Насельніцтва, тыс. чал. (1971)	Адміністрацыйныя цэнтры
Акцюбінская	299,8	562	Акцюбінск
Алма-Аціпская (без Алма-Аты)	104,7	724	Алма-Ата
Гур'еўская	278,6	515	Гур'еў
Джамбульская	144,6	806	Джамбул
Кансцтаўская	78,1	590	Кансцтаў
Карагандзінская	398,8	1590	Караганда
Кзыл-Ардзінская	227,0	504	Кзыл-Арда
Кустанайская	114,6	901	Кустанай
Паўладарская	127,5	714	Паўладар
Паўночна-Казахстанская	44,3	555	Петрапаўлаўск
Сяміпалацінская	179,6	721	Сяміпалацінск
Талды-Курганская	118,5	617	Талды-Курган
Тургайская	111,8	224	Аркалык
Уральская	151,2	523	Уральск
Усходне-Казахстанская	97,3	854	Усць-Каменагорск
Цалінаградская	124,6	763	Цалінаград
Чымкенцкая	114,1	1152	Чымкент

Прырода. Большую частку К. займаюць раўніны і нізкагор'і выш. да 300—1500 м. На З частку Прыкаспійскай і Туранскай нізін, на Пн украіна Заходне-Сібірскай раўніны. На ПнЗ Казахстана Тургайскае плато і горы Мугаджары (г. Вялікі Бактыбай, 657 м). Цэнтр. частку рэспублікі займаюць невысокія горы *Казахскі драбнасопачнік* (г. Аксаран, 1565 м), які з ПдЗ акаймоўваецца плато Бетпак-Дала, пяскамі Муюнкум, з Пд — Таўкум і Сары-Ішыкатрау. На Пд рэспублікі пяскі Кызылкум. На У і ПдУ цягнуцца высокія (3—7 тыс. м) горы са снежнымі вяршынямі і ледавікамі. Калбінскі, Нарымскі, Кучумскі, Паў-



Сакалоўска - Сарбайскі жалезарудны басейн. Здабыча руды.




Электростанции (тысяч квт):
свыше 1 000
от 500 до 1 000
от 100 до 500
менее 100
Тепловые
Гидроэлектростанции
Нефтепроводы
Газопроводы
Рыбопромыслы
Границы
Железные дороги
Автомобильные дороги
Реки
Каналы
Города
Промышленность
Черная металлургия
Цветная металлургия
Машиностроение и металлообработка
Химическая
Нефтеперерабатывающая
Лесная, деревообрабатывающая и целлюлозно-бумажная
Легкая
Пищевая
Строительных материалов
Электроэнергия
Уголь
Нефть
Газ
Железные руды
Марганцевые руды
Хромовые руды
Медные руды
Полиметаллические руды
Никелевые руды
Бокситы
Апатиты
Калийные соли
Фосфориты
Каменная соль
Золото
Серебро
Ртуть
Вольфрам
Молибден
Сурьма
Плавиковый шпат
Асбест
Графит
Слюда
Пьезокварц
Драгоценные и полудрагоценные камни
Строительные материалы
Животноводство
Овцеводство
Свиноводство
Птицеводство
Коневодство
Верблюдоводство
Табаководство
Виноградарство
Садоводство
Рисосеяние
Хлопководство
Свеклосеяние
Субтропические культуры
Зерновое хозяйство
Животноводство
Зерновое хозяйство и животноводство
Животноводство и земледелие
Земледелие
Животноводство и земледелие
Животноводство и земледелие
Животноводство и



Казахская ССР II. 1. Маўзалей Бабаджы-Хатун. 10—11 ст. 2. Б. Р. Рубаненка, Р. А. Сімануў і інш. Дом урада Каз. ССР у Алма-Аце. 1958. 3. Караганда. Савецкі праспект. 4. М. І. Круцільнікаў. Чырвонаармеец. 1937. Каз. дзярж. маст. галерэя імя Шаўчэнкі. Алма-Ата. 5. М. Кенбаеў. Песня чабана. 1956. Музей мастацтва народаў Усходу. Масква. 6. К. Тэльжанаў. Жамал. 1955. Траццякоўская галерэя. Масква.



Арашальны канал у даліне Сырдар'і.



Цалінаград. Праспект Міру.

дзёвы Алтай (найвыш. пункт 3483 м) і інш. хрыбты — адгор'і Алтая. Катлавіна воз. Зайсан аддзяляе іх ад хр. Тарбагатай. Катлавіна воз. Алаколь і горны праход Джунгарскія Вароты в ПнУ, даліна р. Ілі з ПдЗ абмяжоўваюць хр. Джунгарскі Алатау (г. Бесбаскан, 4464 м). На Пд цягнуцца адгор'і Цянь-Шаня — хрыбты Кетмень, Тэрскей-Алатау (г. Хан-Тэнгры, 6995 м, на граніцы з Кірг. ССР), Кунгей-Алатау, Заілійскі Алатау. Каля Каспійскага м. горы Мангыстау, плато Мангышлак, упадзіна Карагіе (132 м ніжэй узр. м.). К. багаты на карысныя выкапні. Вял. запасы кам. вугалю (гал. басейны Карагандзінскі, Экібастузскі), бурага вугалю (Майкубенскі і Убаганскі басейны), нафты (плато Мангышлак і Урала-Эмбінскі раён). Есць медныя і поліметал. руды (Рудны Алтай, Казахскі драбнасопачнік, Каратау, Джунгарскі Алатау), запасы храмітавых рудаў, свінцу, цынку, серабра, вальфраму, малібдэну, кадмію, марганцу, нікелю, кобальту, вісмуту, тытану, алюмінію; волата, барыт, сурма, каруч газ, калійная, каменная і глаўберава соль. Каля Кустаная бліска ад паверхні валяюць жал. руды. У гарах Каратау адно з самых вялікіх у СССР радовішчаў фасфарытаў. Клімат К. рэзка кантынентальны, сухі. Зіма кароткая, на большай частцы суровая, частыя бураны. Сяр. т-ра студз. ад —19 на Пн да —3 °С на Пд. Бываюць маразы да 50 °С. Лета гарачае з сухавеямі. Сяр. т-ра ліп. 19 на Пн, 26 °С на Пд. Часамі паветра награецца да 45 °С. Вегет. перыяд 170 дзён на Пн, 265 на Пд. Ападкаў за год на Пн 300, на Пд 120, у гарах да 1000 мм. Найб. рэкі: Іртыш з прытокамі Бухтарма, Ішым і Табол; Сырдар'я, Урал, Ілі, Эмба ўпадаюць у вялікія бяссцёкавыя азёры; Чу, Сарысу, Нура, Тургай і інш. разбіраюцца на арашэнне або знікаюць у пясках. Жыўленне рэк снегавое, некаторых снегавое і ледавіковае. На рэках гідратэхнічныя збудаванні (на Іртышы, Сырдар'і і інш.). Пабудаваны (1971) канал Іртыш — Караганда даўж. 490 км. Азёры: Каспійскае м., Аральскае м., Балхаш, Алаколь, Тэнгіз, Селетытэніз, Сасыкколь і інш. Зайсан пасля збудавання плаціны на Іртышы стаў вадасховішчам ГЭС; на Сырдар'і створана Чардарынскае вадасховішча. Большасць азёраў саленаватыя і салёныя. Знойдзена каля 70 артэзіянскіх басейнаў в вял. запасамі пітной вады. Пн Казахстана займаюць сярэдне- і малагумусныя чарназёмы (9,5% тэр. рэспублікі), на Пд ад іх каштанавыя (цёмныя, звычайныя, светлыя) глебы разам з саланцамі і саланчакамі (34%). Гэта асн. раён асваення цалінных зямель. Далей на Пд вона бурых і шэра-бурых глебаў (44%). Вял. прасторы займаюць прымітыўныя пясчаныя глебы. У гарах пустынастэпавыя глебы з вышынёй зменьваюцца лесастэпавымі, горналясным, горналугавымі і горнатундравымі. Увдоўж вял. рэк глебы алювіяльныя. У флоры К. не менш як 4750 відаў. На чарназёмах вбярэгліся разнатраўна-злакавыя групоўкі з кавылём і ціпчаком. Трапляюцца асінава-бярозавыя гаі (калкі). Пераважаюць паўпустынныя і пустынныя групоўкі раслін. Пад лесам каля 4% тэр. 10 млн. га пустынь укрыта саксаульнікамі. У гарах вышынная пояснасць. На адгор'ях Алтая тайга з сібірскай лістоўніцы, піхты, елкі, кедра. На Джунгарскім Алатау і адгор'ях Цянь-Шаня лясы з цянь-шаньскай елкі, месцамі з дзікіх пладовых дрэў. На тэр. К. 5 запаведнікаў агульнай пл. 280 тыс. га. Найбольш важныя Аксу-Джабаглы (75 тыс. га, Чымкенцкая вобл.) і Алма-Аціпскі (71,7 тыс. га). Ахоўваюцца сібірскі казярог, архар, казуля, марал, джэйран, сайгак, кулан, белакіпцюровы мядзведзь, дзік, дзікабраз, снежны барс, фазан, улар, кеклік, чырвоны ўюрок, драфа; стрэпет і інш.

Насельніцтва. Большасць насельніцтва — казахі (32,4%, 1970) і рускія (42,8%). Жывуць украінцы (7,2%), татары (2,2%), узбекі (1,6%), беларусы (1,5%, найб. на Пн К.) і інш. Сярэдняя шчыльнасць 4,8 чал. на 1 км². Найб. шчыльна заселены земляробчыя раёны Пн і арашальныя землі Пд. Гарадскога нас. 51%. Найб. гарады: Алма-Ата (753 тыс. ж., 1971), Караганда (530 тыс. ж.), Чымкент (256 тыс. ж.), Сяміпалацінск (241 тыс. ж.), Усць-Каменагорск (235 тыс. ж.).

Гістарычны нарыс. Першыя пасяленні чалавека на тэр. К. ўзніклі ў эпоху палеаліту. У 7—4 ст. да н. э. К. насялялі племянныя саюзы, найбольшы з іх — сакі; у 4—2 ст. да н. э. склаліся племянныя саюзы усуняў (у Сямірэччы), кангюй (у раёнах Каратау і Сырдар'і), аланаў (паміж Аральскім і Каспійскім м.); пачаўся распад першабытнаабшчыннага ладу. Насельніцтва займалася качавой жывёлагадоўляй і арашальным земляробствам. У 6 ст. н. э. ўзнікла першая раннефеад. дзяржава — Цюркскі каганат. У 40-я г. 8 ст. яго змяніў Цюргешскі, у 766—940 Карлукскі каганаты. З араб. заваяваннямі на Пд К. пашырыўся іслам. У 10—11 ст. З і ПдЗ К. ў складзе дзяржавы агузаў. Паўн., Усх., Цэнтр. К. насялялі качавыя плямёны кімакоў і кіпчакоў. У канцы 10 ст. ў раёне Кашгара і Сямірэчча ўзнікла дзяржава Караханідаў, якая распалася ў 30-я г. 12 ст. ў выніку таго, што ўварваліся ў Сямірэчча кідані (каракітаі) і ўтварылі дзяржаву Каракітаяў. На гандл. шляхах і ў аазісах узніклі гарады Атрар, Сыгнак, Саўран, Джэнт, Жанкент, Тараз, Сузак, Кумкент, Туркуль, Акцюбэ і інш. У 1219—21 К. заваявалі манголы, якія знішчылі земляробчыя аазісы, разрабавалі і разбурылі гарады. Большасць тэр. К. ўваходзіла ў *Залатую Арду*, пасля ле распаду — у Белую Арду,

Магалістан, Нагайскую Арду, Сібірскае і Узбекскае ханствы. Моцны феад. прыгнёт, бясконцыя міжусобіцы выклікалі масавую адкачоўку плямёнаў у малазаселеныя далiны р. Чу і Таласа. Цэнтрам аб'яднання каз. плямёнаў стала Сямірэчча. У сярэдзіне 15 ст. тут узніклі самастойныя каз. ханствы. На тэр. аспоўных гасп. раёнаў (Сямірэчча, Цэнтр. К.) узніклі тры каз. жузы (орды) — Старэйшы, Сярэдні і Малодшы. На той час закончыўся працэс утварэння каз. народнасці. Насельніцтва, што жыло на тэр. колішняга Узб. ханства, стала называцца *казахамі*. Гал. галіна гасп.— качавая жывёлагадоўля. Асн. класы грамадства: феадалы (ханы, султаны, бі, батыры, баі, ходжы) і феад. залежныя сяляне — шаруа. Асобнай праслойкай былі патрыярхальныя рабы — кулы. У 17—18 ст. узмацніліся напады на К. джунгараў. Знешняя небяспека, шматвяковая барацьба з захопнікамі прымусілі каз. ханаў звярнуцца да Расіі з просьбай прыняць у сваё падданства. Працэс добраахвотнага далучэння да Расіі пачаўся ў 30-я г. 18 ст. і закончыўся ў 60-я г. 19 ст. (1731 — Малодшы, 1740 — Сярэдні, 1846 — Старэйшы жузы). Далучанне да Расіі было прагрэсіўнае для гістар. лёсу каз. народа. Яно абавіла К. ад нашэсця суседніх адсталых феад. дзяржаў (Хівы, Каканда, Бухары), за спіной якіх стаяла Англія. Сац.-эканам. адносіны, культура казахаў сталі развівацца пад уплывам больш прагрэс. эканомікі і культуры Расіі. Узмацніліся гандл. сувязі, раслі гарады, развіваліся рамёствы і земляробства. Збліжэнне з працоўнымі Расіі асабліва выявілася ў сялянскую вайну пад кіраўніцтвам Е. І. Пугачова (1773—75), у якой удзельнічалі і казахі. У 1867—68 у К. уведзена новая сістэма кіравання, створаны вобласці, устаноўлены новыя прававыя адносіны, абмежаваны правы мусульм. духавенства і інш. У 80—90-я г. 19 ст. на тэр. К. ўзнікла больш за 500 рус. і укр. сёлаў. Усё гэта садзейнічала распаду патрыярхальна-феад. і развіццю капіталіст. адносін. У 90-я г. 19 ст. адбыліся першыя эканам. стачкі. У 1900—03 баставалі рабочыя Спаскага медзеплавільнага з-да, Экібастузскіх капальняў, Успенскага рудніка, Караганды. У 1-ю сусв. вайну рэквізіцыі с.-г. прадуктаў і жывёлы, рост падаткаў і пабораў, прызыў казахаў на тылавыя работы выклікалі сярод сялян масавыя хваляванні, якія ў 1916 перараслі ў нац.-вызв. паўстанне. У Тургайскай вобл. паўстанне ўзначаліў *Амангельды Іманаў*. Пасля Лют. рэв. 1917 у К. ўстанавілася двоеўладдзе. У сак. створаны Саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў у Верным (Алма-Ата), Сяміпалацінску, Петрапаўлаўску, Кустанаі, Акцюбінску і інш. Адначасова існавалі і органы Час. ўрада.

Сав. ўлада ўстаноўлена ў ліст. 1917 — сак. 1918. У грамадз. вайну большую частку К. захапілі белагвардзейцы, якіх падтрымліваў контррэвалюц. «ўрад» бурж.-нацыяналіст. партыі «Алаш Арда». Для барацьбы з ворагам былі створаны Арэнбургскі, Сямірэчанскі і Уральскі франты. У тыле белагвардзейцаў разгарнуўся партыз. рух, які ўзначальвалі падпольныя бальшавіцкія арг-цыі. Летам і ўвосень 1919 Чырв. Армія вызваліла паўн. і ўсх. раёны К. Летам 1920 тэр. К. поўнасцю ачышчана ад белагвардзейцаў. 26.8.1920 дэкрэтам ВЦВК і СНК РСФСР створана Кіргізская (першапачатковая назва К.) АССР у складзе РСФСР, у 1924—25 да К. далучаны паўн. раёны Сырдар'інскай і Сямірэчанскай абл. Гэтым закончылася ўз'яднанне каз. зямель. У 1925 Кірг. АССР перайменавана ў Каз. АССР; 5.12.1936 пераўтворана ў Каз. ССР. За даваенныя пяцігодкі ў К. пабудавана каля 200 буйных прамысл. прадпрыемстваў, створана 3-я вугальная база краіны ў Карагандзе, пабудавана чыг. Турксіб. У 1937 калгасы аб'ядналі 97,5% сялянскіх гаспадарак. Ажыццявіўся пераход каз. народа да сацыялізма, мінаючы капіталіст. стадыю развіцця. У Айч. вайну К. ператварыўся ў магутны арсенал краіны. Тут размясціліся 142 эвакуіраваныя прадпрыемствы. Аб'ём прамысл. прадукцыі за гады вайны павялічыўся ў 1,5 раза. Сфарміраваны дзесяткі вайск. злучэнняў і часцей. Больш як 100 тыс. казахстанцаў узнаг. ордэнамі і медалямі, каля 500 казахстанцаў, у т. л. 99 казахаў, сталі Героямі Сав. Саюза. 20.10.1956 за паспяховае асваенне цалінных зямель К. узнаг. ордэнам Леніна, 20.10.1970 — ордэнам Кастр. Рэвалюцыі.

Камуністычная партыя, камсамол, прафсаюзы. Першыя марксісцкія гурткі ўзніклі ў пач. 20 ст. ў Петрапаўлаўску, Какчэтаве, Уральску, Акмолінску і Верным (Алма-Ата). Яны былі звязаны з марксісцкімі с.-д. арг-цыямі Омска, Ташкента, Самары, Арэнбурга. Пасля II з'езду РСДРП (1903) гурткі ў асобных гарадах ператварыліся ў с.-д. арг-цыі. У 1900—07 с.-д. групы і арг-цыі створаны ў Акцюбінску, Казаліншку, Пяроўску (Кзыл-Арда), Кустанаі, Верным. У рэв. 1905—07 с.-д. арг-цыі ўзначальвалі стачкі рабочых, вялі паліт. агітацыю сярод сялян. У 1-ю сусв. вайну пад кіраўніцтвам камуністаў на многіх прадпрыемствах адбываліся стачкі. Бальшавікі К. ўзначальвалі барацьбу працоўных К. за ўстанаўленне ўлады Саветаў. У грамадз. вайну камуністы К. мабілізавалі працоўных на барацьбу супраць белагвардзейцаў і інтэрвентаў. Падпольныя парт. арг-цыі паўн.-ўсх. раёнаў К. ўзначальвалі партыз. барацьбу ў тыле калчакоўскіх войск. У чэрв. 1921 у Арэнбурзе адбылася 1-я абл. канфер. камуністаў К., якая закончыла арганіз. афармленне парт. арг-цыі рэспублікі. Паводле рашэння ЦК ВКП(б) у 1937 краявая парт. арг-цыя пераўтворана ў Камуніст. партыю (бальшавікоў) Казахстана [КП(б)К]. У перыяд сацыяліст. буд-ва КП(б)К — арганізатар індустрыялізацыі рэспублікі і калектывізацыі с. гасп. У Айч. вайну $^2/_3$ камуністаў і камсамольцаў рэспублікі былі на фронце. Пасля вайны камуністы К. ўзначальваюць барацьбу працоўных за далейшы ўздым нар. гаспадаркі. На 1.1.1971 у Камуніст. партыі Казахстана 16 804 пярвічныя арг-цыі, якія аб'ядноўваюць 575 439 камуністаў.

Першыя камсамольскія арг-цыі К. ўзніклі ў канцы 1918. У грамадз. вайну камсамольцы К. мужна абаранялі Сав. рэспубліку. У ліп. 1921 у Арэнбурзе адбылася 1-я Усеказахская краявая канфер. камсамола. У 1937 камсамольская арг-цыя К. пераўтворана ў Ленінскі Камуніст. Саюз Моладзі Казахстана (ЛКСМК). У кастр. 1937 адбыўся 1-ы з'езд ЛКСМК. Камсамольцы К. актыўна ўдзельнічалі ў буд-ве Турксіба, Балхашскага медзеплавільнага камбіната, Чымкенцкага свінцовага з-да; у калектывізацыі с. гасп. рэспублікі. У Айч. вайну 94 камсамольцам К. прысвоена званне Героя Сав. Саюза. У 1971 у ЛКСМК 1230 тыс. членаў. ЛКСМК узнагароджаны ордэнам Леніна (7.7. 1971).

Прафсаюзы К. шырока развіліся толькі пасля Кастр. рэвалюцыі. У 1922 арганізавана Каз. бюро ВЦСПС. На канец 1970 аб'ядноўвалі 4657 тыс. членаў.

Табліца 2

Вытворчасць найважнейшых відаў прадукцыі

Віды прадукцыі	1913	1940	1950	1960	1970
Электраэнергія, млрд. *кет · гадз*	0,1	0,6	2,6	10,5	34,7
Вугаль, млн. *т*	0,1	7,0	17,4	32,4	61,6
Нафта, млн. *т*	0,1	0,7	1,1	1,6	13,2
Чыгун, тыс. *т*	—	—	—	274	1767
Сталь, тыс. *т*	—	—	31	305	2225
Штучныя ўгнаенні (умоўныя адзінкі), тыс. *т*			22	477	1957
Цэмент, тыс. *т*	—	—	15,7	2173	5654
Тканіны баваўняныя, млн. *м*	—	0,1	4,9	20,4	64,1
Тканіны шарсцяныя, тыс. *м*	139	406	2145	4061	4989
Абутак скураны, млн. пар	—	1,2	3,3	12,3	27,8
Цукар-пясок, тыс. *т*	—	70,9	71,8	122,8	176,2
Мяса (разам з субпрадуктамі 1-й катэгорыі), тыс. *т*	—	97,0	109,6	278,2	524,9

Народная гаспадарка. У 1970 аб'ём прамысл. прадукцыі К. павялічыўся ў параўнанні з 1913 у 145 разоў, а з 1940 — у 18,7 раза. Рэспубліка займае ў краіне 3-е месца (пасля РСФСР і УССР) па аб'ёме прамысл. і с.-г. вытворчасці. Прамысловасць дае 50,6% (1968) усёй прадукцыі нар. гасп. (гл. табл. 2). На галіны, што выпускаюць сродкі вытворчасці, прыпадае больш за 60% валавой прадукцыі прамысловасці рэспублікі.



Свінцовы завод у Чымкенце.



Стварэнне мастацкага дывана (Алма-Ата).

Развіта горназдабыўная прамысловасць: каменнавугальная, нафтавая, рудаў каляровых і чорных металаў, хім. сыравіны, буд. матэрыялаў (гл. эканам. карту). У паліўным балансе важнае месца займае вугаль (70%) і нафта. Больш за 80% эл. энергіі даюць цеплавыя электрастанцыі; ГЭС на рэках Іртыш, Сырдар'я,Ілі і інш. Развіта каляровая металургія. Выплаўка медзі на Балхашскім і Джэзказганскім горнаметалург. камбінатах, Карсакпайскім і Іртышскім (Глыбокае) з-дах, свінцу і цынку — на Ленінагорскім і Усць-Каменагорскім камбінатах, Чымкенцкім з-дзе. У Паўладары алюмініевы з-д, у Усць-Каменагорску — тытана-магніевы камбінат. Прадпрыемствы чорнай металургіі — Карагандзінскі і Казахскі металург. з-ды ў Тэміртау; з-ды ферасплаваў у Акцюбінску і Ермаку. У Кустанайскай вобл. Сакалоўска-Сарбайскі і будуецца (1972) Лісакоўскі горнаабагачальныя камбінаты. Цэнтры машынабудавання: Алма-Ата (з-ды цяжкага машынабудавання, станкабудавання, электратэхнічны, электрамеханічны, абсталявання для харч. прамысловасці), Караганда (з-д горнашахтавага абсталявання), Гур'еў (з-д нафтавага абсталявання), Цалінаград («Казсельмаш»), Паўладар (трактарны з-д), Акцюбінск (з-д рэнтгенаапаратуры), Чымкент (з-д прэсаў-аўтаматаў і электраапаратуры), Уральск (арматурны з-д), Сяміпалацінск (з-ды абсталявання для харч. прамысловасці, кабельных вырабаў), Петрапаўлаўск (з-д малалітражных рухавікоў), Усць-Каменагорск (з-д горнага абсталявання). З прадпрыемстваў хім. прамысловасці найбольшыя горнахім. камбінат у Каратау, суперфасфатны з-д у Джамбуле, з-ды фосфарных соляў, хіміка-фармацэўтычны і гідролізны ў Чымкенце, хім. камбінаты ў Алзе і ў Паўладары, з-ды сінт. каўчуку ў Тэміртау, поліэтыленавы ў Гур'еве і штучнага валакна ў Кустанаі і інш. Ва ўсіх абласцях К. выпускаюцца буд. матэрыялы.

З лёгкай прамысловасці найб. развіты гарбарна-абутковая, аўчынна-кажушная, футравая, валюшная, воўнамыйная, суконная. Цэнтры тэкст. прамысловасці: Алма-Ата, Чымкент, Сяміпалацінск, Кустанай. У многіх гарадах трыкатажныя і швейныя ф-кі. Гал. галіна харч. прамысловасці — мясная (больш за 40 мясакамбінатаў). Сотні масларобна-сыраварных і малочных з-даў, найбольш на Пн і ПнУ рэспублікі, цукр. заводы, млынкамбінаты. Вытворчасць алею з бавоўніку і сланечніку, кансерваў з садавіны і агародніны, вінаробства. Рыбалоўства і рыбная прамысловасць (на Каспійскім і Аральскім м., на азёрах Балхаш, Зайсан і інш.).

Паводле рашэнняў XXIV з'езду КПСС за гады 9-й пяцігодкі ў Казахстане аб'ём вытворчасці прамысл. прадукцыі павялічыцца на 57—60%. Выпуск рафінаванай медзі павялічыцца ў 1,7 раза, мінер. угнаенняў у 2,4, с.-г. машын у 2,6 раза. У 1975 здабыча вугалю дасягне 91 млн. *т*, нафты 30 млн. *т*, вытворчасць гатовага пракату да 5 млн. *т*, цэменту да 7,5 млн. *т*, баваўняных тканін да 108—118 млн. *м²*, шарсцяных да 40 млн. *м²*, скуранога абутку да 34—39 млн. пар, трыкатажных вырабаў да 98 млн. штук.

На 1.1.1971 было 1609 саўгасаў і 449 калгасаў. Пасяўная пл. за гады Сав. улады павялічылася з 4,2 млн. *га* ў 1913 да 30,9 млн. *га* ў 1970. У 1954—68 асвоена 25,5 млн. *га* цалінных і абложных зямель. У асваенні цалінных і абложных зямель К. актыўна ўдзельнічалі прадстаўнікі амаль 40 нацыянальнасцей СССР, у т. л. беларусы. Па пуцёўках камсамола Беларусі ў 1954 і 1955 у К. паехала 33,4 тыс. юнакоў і дзяўчат (у т. л. 4 тыс. механізатараў с. гасп.), а ў наст. гады 21,9 тыс. механізатараў і больш за 3 тыс. будаўнікоў. Беларуская ССР укамплектавала маладымі кадрамі 24 саўгасы Кустанайскай, Какчэтаўскай і Усходне-Казахстанскай абл. Штогод у К. на «працоўны семестр» прыязджаюць студэнты ВНУ Беларусі. У выніку асваення цалінных і абложных зямель у К. вырасла ўдзельная вага земляробства ў сельскай гаспадарцы. Пасевы пераважна ў паўн. стэпавых і перадгорных усх. і паўд. раёнах. Гал. галіна земляробства — збожжавая гаспадарка. Сеюць яравую і азімую пшаніцу, ячмень, авёс, проса, рыс, кукурузу на зерне і на зялёны корм, цукр. буракі, бавоўнік, жоўты тытунь, кунжут, лекавы мак, сланечнік, гарчыцу, рыжык і лён-кудравец (гл. табл. 3 і эканам. карту). Садоўніцтва і вінаградарства, бахчаводства. Агародніцтва і бульбаводства вакол гарадоў і прамысл. цэнтраў. Развіта жывёлагадоўля (гл. табл. 4). Авечак гадуюць ва ўсіх абласцях, найб. на Пд (каля ½ усяго пагалоўя). На Пд і У пераважаюць танкарунныя і паўтанкарунныя пароды. У цэнтр. і зах. К. гадуюць грубашэрсных курдзючных авечак, на Пд каракульскіх. Асн. раён гадоўлі буйн. раг. жывёлы — паўн. вобласці (каля ½ усяго пагалоўя). Развіваецца птушкагадоўля. У перадгор'ях паўд. К.— шаўкаводства, на Алтаі — пчалярства і маралагадоўля. За гады 9-й пяцігодкі сярэднегадавы збор збожжа дасягне 24 млн. *т*, будзе ўведзена ў дзеянне прыкладна 420 тыс. *га* арашальных зямель. Сярэднегадавая вытворчасць мяса складзе прыкладна 1 млн. *т*, малака 4,2 млн. *т*, воўны 110 тыс. *т*, яец 2,1 млрд. штук.

Найбольш развіты чыг. транспарт. Даўж. чыгунак 13,7 тыс. *км* (1971), 80% пабудавана за гады Сав. улады. Гал. чыг. магістралі: Арэнбург — Ташкент, Сяміпалацінск — Алма-Ата — Арысь (Турксіб), Магнітагорск — Цалінаград — Паўладар — Барнаул, Петрапаўлаўск — Караганда — Чу, Кунград — Макат. Аўтамаб. дарог (1969) 109 тыс. *км*, у т. л. з цвёрдым пакрыццём 40,3 тыс. *км*. Суднаходства па Каспійскім і Аральскім м., па азёрах Балхаш, Зайсан, па Іртышы (85—90% усяго грузаабароту рачнога транспарту) і інш. рэках. Даўжыня суднаходных шляхоў К. 5,8 тыс. *км*. Газаправоды Сярэдняя Азія — Цэнтр, Бухара — Урал, Бухара — Ташкент — Чымкент — Джамбул — Алма-Ата; нафтаправоды Узень — Гур'еў — Куйбышаў, Гур'еў — Орск. Развіваецца авіятранспарт. Даўжыня паветр. ліній рэспублікі (1969) каля 70 тыс. *км*. У 9-й пяцігодцы будзе пабудаваны нафтаправод Омск — Паўладар — Чымкент, пачнецца буд-ва чыг. Макат — Аляксандраў Гай.

Табліца 3

Структура пасяўных плошчаў
(усе катэгорыі гаспадарак, тыс. *га*)

Пасяўная плошча	1913	1940	1950	1960	1970
Усяго	4146	6746	7759	28 432	30 857
Збожжавыя культуры	3881	5795	6019	21 932	22 590
У тым ліку					
яравая пшаніца	2391	3223	3693	17 323	16 492
проса	455	903	465	865	716
рыс	25	28	30	12	81
кукуруза (на зерне)	9	9	45	80	44
Цукровыя буракі (фабрычныя)	—	78	60	43	70
Сланечнік	19	165	157	135	93
Бавоўнік	21	78	60	43	44
Бульба	42	99	140	174	192
Агародніна	12	23	28	45	50
Кармавыя культуры	92	480	1214	5895	7652

Табліца 4

Пагалоўе прадукцыйнай жывёлы
(на пачатак года, ва ўсіх катэгорыях гаспадарак, тыс. галоў)

Жывёла	1913	1941	1951	1961	1971
Буйная рагатая	5062	3335	4422	5501	7240
У тым ліку					
каровы	1876	1251	1431	2055	2667
Авечкі і козы	18 364	7914	17 638	28 250	31 754
Свінні	280	449	399	1759	2227

Ахова здароўя. У 1913 на тэр. сучаснай Каз. ССР было 98 бальнічных устаноў на 1800 ложкаў (3,2 на 10 тыс. ж.), 196 урачоў (0,4 на 10 тыс. ж.), 393 чал. сярэдняга мед. персаналу (0,7 на 10 тыс. ж.). У 1940 — 617 бальнічных устаноў на 25,1 тыс. ложкаў (39,7 на 10 тыс. ж.), 2,7 тыс. урачоў (4,3 на 10 тыс. ж.), 11,9 тыс. чал. сярэдняга мед. персаналу (18,7 на 10 тыс. ж.). На пач. 1971 працавалі 1946 бальнічных устаноў на 154,6 тыс. ложкаў (118,3 на 10 тыс. ж.), 2192 урачэбныя ўстановы амбулаторна-паліклінічнай дапамогі, 5 мед. ін-таў, 28,7 тыс. урачоў (21,9 на 10 тыс. ж.), 104,8 тыс. чал. сярэдняга мед. персаналу (80,2 на 10 тыс. ж.). 97 санаторыяў на 14,6 тыс. ложкаў, 29 дамоў адпачынку на 7,1 тыс. ложкаў. Курорты бальнеалагічныя, грязевыя, клімата-кумысалячэбныя: Алмаарасан, Арасан-Капал, Яныкурган, Муялды, Баравое; санаторыі: Аяк-Калкан, Гур'еўскі, Сарыагач, Турксіб, Шчучынскі.

Народная асвета, навуковыя ўстановы. Да Кастр. рэвалюцыі сярод каз. насельніцтва было 2% пісьменных. У 1914/15 навуч. г. працавала 2 тыс. школ (104,7 тыс. вучняў), з іх толькі 12 сярэдніх (3996 вучняў). ВНУ не было. За гады Сав. улады ў К. ліквідавана непісьменнасць, ажыццёўлена



Будынак Акадэміі навук Казахскай ССР.

усеагульнае абавязковае навучанне. У 1970 было 5783 дашкольныя дзіцячыя ўстановы, у якіх выхоўвалася больш за 558 тыс. дзяцей. У 1970/71 навуч. г. працавала 10 041 агульнаадук. школа ўсіх тыпаў (3190,8 тыс. вучняў), 190 сярэдніх спец. навуч. устаноў (216,2 тыс. навучэнцаў), 44 ВНУ (198,9 тыс. студэнтаў). Найбольшыя ВНУ: *Казахскі універсітэт* імя Кірава, політэхн., с.-г., зоавет., нар. гасп., мастацтва, пед. і мед. ін-ты, Цалінаградскі інж.-буд. ін-т і інш. У К. (1970) 7650 масавых б-к (65 млн. экз. кніг і часопісаў), самыя буйныя: б-ка імя Пушкіна (нац. кнігасховішча), б-ка АН Каз. ССР, навуковая с.-г., навук.-тэхнічная; музеяў 29 (Дзярж., Цэнтр. музей Казахстана, Літ. мемарыяльны музей М. А. Аўэзава, музей прыроды, гісторыка-рэвалюц. музеі і інш.).

У 1970 працавала больш за 200 навук. устаноў: *Акадэмія навук Казахскай ССР* (ін-ты астрафізікі, яд. фізікі, геал. навук, эканомікі, гісторыі, археалогіі і этнаграфіі, л-ры і мастацтва і інш.), НДІ клінічнай і эксперым. хірургіі, анкалогіі і радыялогіі, механізацыі і электрыфікацыі с. гасп., эканомікі і арганізацыі с. гасп., пед. навук імя Алтынсарына і інш.

Друк, радыё, тэлебачанне. У 1970 у К. выдавалася 355 газет, у т. л. рэспубліканскія «Социалистік Казакстан» («Сацыялістычны Казахстан»), «Казахстанская правда», «Лениншіл жас» («Ленінская моладзь»), «Ленинская смена», «Коммунизм туғи» («Сцяг камунізма», на уйгурскай мове) і інш.; 25 часопісаў. У К. ў 1970 выдадзена 2022 назвы кніг тыражом 22 309 тыс. экз. У Алма-Аце — тэлецэнтр, радыёстанцыя. Амаль усе абл. цэнтры рэспублікі маюць свае тэлестудыі ці рэтрансляторы і радыёстанцыі мясцовага вяшчання.

Літаратура. У фальклоры казахаў бытавыя і абрадавыя песні, казкі, прыказкі, гераічны эпас, ліра-эпічныя паэмы, гістар. песні, айтысы, талгаў (філас. роздумы), арнаў (прысвячэнні) і інш. Аўтарскія творы паявіліся ў 18 ст. Першы, чыё аўтарства вядомае, Бухар Жырау Калкаманаў (1693—1787), стваральнік вострых паліт. і публіцыст. песень-талгаў. З далучэннем К. да Расіі пачаўся новы этап у развіцці духоўнай культуры казахаў. Акыны М. Утэмісаў, Ш. Жарылгасаў, С. Аранаў, пачынальнікі грамадз. паэзіі ў каз. л-ры, выступалі супраць феад.-калан. прыгнёту балў, біяў, царскіх сатрапаў. У 2-й пал. 19 ст. тварылі акыны-імправізатары, удзельнікі айтысаў (песенных спаборніцтваў) Біржан, Сара, Жанак, Асет, *Джамбул Джабаеў*, а таксама акыны-песеннікі Ахан-серэ, Жалў-Муса. З іх імёнамі звязана бурнае развіццё айтыса, накіраванага супраць прыгнятальнікаў, і лірычных песень з грамадз. матывамі. Асветнікі 2-й пал. 19 ст. Ч. Валіханаў, І. *Алтынсарын*, *Абай Кунанбаеў* зрабілі вял. ўклад у станаўленне каз. пісьмовай л-ры і літ. мовы, прапагандавалі рус. культуру. Абай абнавіў тэматыку л-ры, увёў новыя формы і жанры паэзіі. Яго паэт. традыцыі ў пач. 20 ст. прадоўжылі пісьменнікі дэмакр. кірунку С. Тарайгыраў, С. Данентаеў, С. Кубееў, М. Сералін. Пачынальнікамі каз. сав. л-ры былі С. *Сейфулін*, вядомы паэт-рэвалюцыянер, заснавальнік сацыяліст. рэалізму ў каз. л-ры, В. *Майлін*, І. *Джансугураў*, С. *Муканаў*, М. *Аўэзаў*. У сярэдзіне 20-х г. у л-ру прыйшлі паэты А. Такмагамбетаў, І. Байзакаў, Ж. Сыздыкаў, К. Абдыкадыраў, А. Тажыбаеў, Т. Жарокаў, празаікі Г. *Мусрэпаў*, С. Шарыпаў, Г. *Мустафін*, драматургі Ж. Шанін і С. Абланаў. Яны змагаліся за прынцыпы партыйнасці і народнасці ў каз. л-ры. У 30-я г. расшыраецца тэматыка каз. л-ры, асвойваецца сацыяліст. рэалізм як асн. творчы метад (паэма «Альбатрос» Сейфуліна, раман «Азамат Азаматавіч» і драма «Фронт» Майліна, паэмы «Кюйшы» і «Кулагер» Джансугурава, раманы «Тэміртас» і «Батагоз» Муканава, раман «Мае равеснікі» С. Ерубаева, драма «Амангельды», калгасныя апавяданні Мусрэпава, паэма «Сонца загаварыла» Жарокава і інш.). Шырокую вядомасць атрымала творчасць Джамбула. У Айч. вайну развіваецца балвая грамадз. лірыка (песні Джамбула, паэма «Сказание про смерць паэта» К. Аманжолава і інш.). У час вайны створаны п'есы «Гадзіна выпрабаванняў» Аўэзава, «Амангельды» Ш. Хусаінава, «Трагедыя паэта» Мусрэпава. У пасляваенны перыяд напісаны раманы пра работнікаў с. гасп.— «Сыр-Дар'я», «Стэпавыя хвалі» Муканава, «Мільянер» Мустафіна, «Племя маладое» Аўэзава, «Акбоат» Т. Алімкулава, пра рабочы клас — «Караганда» Мустафіна, «Тэміртау» З. Шашкіна, «Гудок у стэпе» М. Каратаева, аповесці пра маладых сучаснікаў — «Першыя месяцы» М. Іманжанава, «Інеш» С. Шаймердэнава, «Іскра жыцця» З. Кабдолава. Эпапею «Шлях Абая» закончыў у 50-я г. Аўэзаў. Жыццё каз. народа ў 1-й пал. 20 ст. адлюстравана ў трылогіях «Школа жыцця» Муканава, «Яік — светлая рака» Х. Есенжанава, «Кроў і паэт» А. Нурпеісава. У апошні час створаны шэраг гістар. раманаў (Муканаў, Д. Абілеў, С. Бакбергенаў, А. Алімжанаў), раманаў і аповесцей на сучасныя тэмы (Шашкін, С. Жунусаў, Р. Тактараў, Т. Ахтанаў і інш.). Больш шматгранную стала лірыка, пашырыліся гарызонты эпічнай паэзіі (К. Тагузакаў, Х. Бекхожын, Г. Каірбекаў, Х. Ергаліеў, Тажыбаеў, Жарокаў). Пра У. І. Леніна напісаны паэмы «Ільіч» М. Макатаева, «Геній» К. Мырзаліева, «Вартавы» Такмагамбетава. П'есы пра сучаснікаў стварылі А. Абішаў, Тажыбаеў, Хусаінаў, Ахтанаў, К. Мухамеджанаў і інш. Развіваюцца крытыка і літаратуразнаўства (К. Джумалиеў, М. Каратаеў, Е. Ісмаілаў, М. Габдулін).

Бел.-каз. літ. сувязі пачынаюцца ў 30-я г. 20 ст. У 1935 на каз. мову пераклі вершы Я. Купалы, у 1936 — Я. Коласа. На каз. мове выйшлі «Дрыгва» Я. Коласа (1956), яго зб. «Вершы» (1956), раман І. Шамякіна «Глыбокая плынь» (1954), зб. апавяданняў Т. Хадкевіча «За сінім лесам» (1956). У перыёдыцы апубл. пераклады твораў П. Броўкі,





Каргалінская дыядэма. Дэталь. Золата, інкрустацыя бірузою. 2 ст. да н. э.— 2 ст. н. э. (злева). Кашма. Дэталь. 19—20 ст. Абедзве ў Цэнтр. музеі Казахстана.

Я. Брыля, Я. Коласа, У. Корбана, А. Куляшова, Я. Купалы, М. Танка, І. Шамякіна і інш. На бел. мове выйшлі «Песні і паэмы» Джамбула (1939), «Выбранае» Абая Кунанбаева (1970). У часопісах і газетах надрукаваны пераклады твораў Абая Кунанбаева, С. Адамбекава, Ю. Алтайбаева, Ж. Амірбекава, Г. Арманава, Аўэзава, Джансугурава, Ж. Жумаканава, Маўленава, Дж. Мулдагаліева і інш.

Архітэктура. Ад бронзавага веку асталіся рэшткі аселых паселішчаў. У 6—12 ст. развіваліся гарады Сайрам, Тараз, Атрар і інш., будаваліся ваен. крэпасці і ўмацаванні, замкі-сядзібы феадалаў (замак у гарадзішчы Баба-ата, палац-замак Тас-Акыр і інш.). З пашырэннем ісламу паяўляюцца новыя тыпы будынкаў — мячэці, медрэсэ, караван-сараі. Складваюцца характэрныя арх. прыёмы: дакладныя простыя планы, скляпеністыя і купальныя перакрыцці, дэкар. апрацоўка фасадаў фігурнай муроўкай і разьбяной тэракотаю. Пашыраны тып збудаванняў — маўзалеі — цэнтрычныя купальныя, пераважна з абпаленай цэглы (маўзалей Баян-Слу, Бабаджы-хатун, 10—11 ст.; Айша-Бібі, 11—12 ст.). Пасля манг. нашэсця (13 ст.) буд-ва ўзнаўляецца ў канцы 14—15 ст. (комплекс маўзалея Хаджа Ахмеда Ясаві). Нар. жыллё (пастаяннае — пераважна глінабітнае, пераноснае — юрты) аздаблялася разьбою, тканымі паласамі і інш. У 17—19 ст., асабліва пасля далучэння К. да Расіі, узнік шэраг гарадоў (Уральск, Гур'еў, Усць-Каменагорск, Сяміпалацінск і інш.), але забудова і добраўпарадкаванне іх былі на нізкім узроўні. За гады Сав. улады паявіліся дзесяткі новых гарадоў, сотні нас. пунктаў. Шырока выкарыстоўваюцца мясцовыя буд. матэрыялы (гіпс, камышыт) і сучасныя індустр. метады буд-ва (зборны жалезабетон, буйныя блокі і інш.). Алма-Ата ператварылася ў прыгожы, рэгулярна спланаваны горад-сад з добраўпарадкаванымі жылымі дамамі і манумент. грамадскімі пабудовамі (гал. паштамт, арх. Г. Герасімаў; Каз. т-р оперы і балета імя Абая, арх. М. Прастакоў; гал. будынак АН Каз. ССР, арх. А. Шчусеў, М. Прастакоў; Дом урада Каз. ССР, арх. Б. Рубаненка, Р. Сіманаў і інш.; цэнтр. стадыён, арх. А. Капанаў, А. Косаў; гасцініца «Алма-Ата», арх. А. Картасіс, І. Чыркін і інш.; Палац імя Леніна, арх. М. Рыпінскі, У. Кім і інш.). Вял. буд-ва ідзе ў Карагандзе, Усць-Каменагорску, Чымкенце, Кустанаі, Джамбуле, Гур'еве і інш. Іл. гл. таксама на ўкл.

Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Найбольш стараж. (2—1-е тысячагоддзі да н. э.) помнікі на тэр. К.— наскальныя выявы, керамічныя вырабы, фігуркі жывёл з металу, ювелірныя вырабы (асабліва пашыраны на мяжы н. э.; прадметы з Беркарынскага могільніка, Каргалінскага скарбу і інш.). Шырока развівалася з даўніх часоў дэкар.-прыкладное мастацтва, звязанае з качавым ладам жыцця: арнаментальная разьба па дрэве, камені і косці, узорыстае ткацтва, вышыўка, цісненне па скуры, кераміка. З узнікненнем аселых паселішчаў, гарадоў арнамент. мастацтва выкарыстоўвалася ў архітэктуры. У арнаменце пашыраны буйныя стылізаваныя раслінныя і геам. матывы. Першы мастак-казах — вучоны-асветнік Ч. Валіханаў. У сав. час пашырылася станковае мастацтва. У 20—30-я г. 20 ст. працуюць жывапісцы М. Хлудаў, М. Круцільнікаў, А. Ісмаілаў, З. Назыраў, графікі Х. і К. Ходжыкавы, жывапісец і графік В. Антошчанка-Аленеў, А. Касцееў. Створана маст. вучылішча (1938). У канцы 30—40-х г. працуюць жывапісцы Л. Лявонцьеў, М. Лізагуб, А. Чаркаскі, графікі К. Баранаў, М. Гаеў і інш., з 50-х г.— М. Кенбаеў, С. Мамбееў, К. Тэльжанаў, К. Шаяхметаў, А. Сцяпанаў (карціны з мінулага і сучаснага жыцця каз. народа), А. Галімбаева (кампазіцыі і партрэты), Н.-В. Нурмухамедаў (гістар. карціны і партрэты), Н. Тансыкбаеў (пейзаж); графікі С. Раманаў, Я. Сідоркін, Ш. Кенжэбаеў і інш. Развіваецца скульптура — Х. Наурзбаеў, Т. Дасмагамбетаў, Б. Тулекаў і інш. У 1930 створаны Саюз мастакоў Казахскай ССР. У Алма-Аце — Мастацкая галерэя імя Шаўчэнкі (заснавана ў 1935). Ілюстрацыі гл. таксама на ўкл.





А. Галімбаева. Маці-гераіня. 1960 (злева). Х. Наурзбаеў. Партрэт артыста С. Кажамкулава. Мармур. 1962. Казахская дзярж. маст. галерэя імя Шаўчэнкі. Алма-Ата.

Ч. Валіханаў. Сартай з роду Сары Багіш. Малюнак. 1856 (злева). К. Баранаў. Ілюстрацыя да уйгурскай народнай казкі «Булбугія». 1951.





Музыка К. ў дарэвалюц. час існавала выключна ў форме нар. творчасці. Традыц. віды выканальніцтва: сольныя спевы пад уласны акампанемент на дамбры (2-струнны шчыпковы інструмент) ці на кабызе (2-струнны смыковы), сольная ігра на гэтых інструментах і на сыбызгы (духавы тыпу флейты). Вак. музыка аднагалосая, мае разнастайныя куплетныя і рамансавыя формы, інструментальная — двухгалосая, асн. форма — кюй (праграмная цыклічн. п'еса). Носьбіты прафес. нар. мастацтва: аншы (спевакі), кюйшы (інструменталісты), акыны (паэты вуснай традыцыі, якія спяваюць пад акампанемент свае вершы, імправізацыі), жыршы (апавядальнікі эпасу). Пасля далучэння К. да Расіі ў музыцы адчуваецца ўплыў рус. дэмакр. культуры, пашыраюцца песні на словы А. Пушкіна, М. Лермантава ў перакладах Абая. Сярод нар. музыкантаў 19—20 ст. вылучаюцца дамбрысты Курмангазы Сагырбаеў, Даўлеткерэй Шыгаеў, Татымбет, спевакі Біржан Кажагулаў, Мухіт Мераліеў, Ахансерэ Карамсін і інш., творы якіх сталі нар. муз. класікай. У сав. час у нар. выканальніцтве паявіліся хар. спевы, ансамблевая ігра на муз. інструментах. Зарадзіліся і значна развіліся ўсе жанры прафес. музыкі (опера, балет, сімфонія, араторыя, кантата, камерныя віды і інш.). Вял. ўклад у развіццё каз. сав. музыкі зрабілі рус. музыканты: фальклярысты А. Затаевіч, Б. Ерзаковіч, кампазітар Я. Брусілоўскі. Сфарміравалася каз. кампазітарская школа (Б. Байкадамаў, Г. Жубанава, А. Жубанаў, К. Кужам'яраў, Е. Рахмадыеў, М. *Тулебаеў*, Л. Хамідзі і інш.). Сярод музыкантаў-выканаўцаў: вакалісты Р. Абдулін, К. *Байсеітава*, Ш. Бейсекава, Б. Дасымжанаў, Р. Жаманава, Е. Серкебаеў, дырыжоры Ш. Кажгаліеў, Ф. Мансураў. У рэспубліцы працуюць Каз. т-р оперы і балета імя Абая (з 1933), Дзярж. філармонія імя Джамбула (з 1935; у яе складзе дзярж. аркестр нар. інструментаў імя Курмангазы, Дзярж. каз. хар. капэла, сімф. аркестр), Дзярж. ансамбль песні і танца Каз. ССР (з 1955), Саюз кампазітараў Казахстана (з 1939), кансерваторыя (з 1944), 5 муз. вучылішчаў, сетка муз. школ.

Тэатр. Элементы тэатр. мастацтва казахаў былі ў стараж. нар. абрадах і гульнях, драматызаваных выкананнях нар. эпасу, у выступленнях нар. комікаў, сатырыкаў, у песенных спаборніцтвах акынаў. Пасля рэв. 1905—07 паявіліся творы нац. драматургіі, у гарадах ставіліся аматарскія спектаклі на каз. мове. Пасля Кастр. рэвалюцыі вял. значэнне для развіцця тэатр. мастацтва мела самадзейнасць каз. студэнцтва (20-я г.). У 1925 у Кзыл-Ардзе створаны каз. прафес. т-р (Каз. т-р драмы імя Аўэзава, з 1928 у Алма-Аце). У 1932 у Алма-Аце арганізавана муз.-драм. школа. У 30-я г. пачалося інтэнсіўнае развіццё сеткі абл. і калгаснасаўгасных т-раў. Творчыя поспехі каз. т-ра звязаны з пастаноўкай рус. класікі, п'ес савецкіх драматургаў, у т. л. каз.: М. Аўэзава, Г. Мусрэпава, А. Тажыбаева, Ш. Хусаінава, А. Абішава, К. Мухамеджанава. У канцы 40 — пач. 50-х г. паглыбленню рэаліст. мастацтва т-раў садзейнічала праца над рус. і зах.-еўрап. класікай. У 2-й пал. 50-х г. аднавіліся пастаноўкі спектакляў фальклорна-гістар. зместу. Новы этап развіцця нац. т-ра вызначылі спектаклі пра сучаснае жыццё рэспублікі. У Каз. ССР працуе 22 драм. т-ры (1970). У т-рах ставіліся бел. п'есы: «Хто смяецца апошнім» К. Крапівы (Карагандзінскі рус. т-р, 1941; Паўладарскі рус. т-р імя Чэхава, 1958), «Канстанцін Заслонаў» (Кустанайскі рус. т-р, 1947; Чымкенцкі каз. т-р, 1948; Усць-Каменагорскі т-р імя Джамбула, 1957) і «Пад адным небам» А. Маўзона (Алма-Ацінскі рус. т-р, 1963), «Выбачайце, калі ласка!» (Карагандзінскі каз. т-р імя Сейфуліна, Карэйскі муз.-драм. т-р, Кустанайскі рус. т-р, Сяміпалацінскі аб'яднаны т-р імя Абая — усе ў 1954) і «Лявоніха на арбіце» А. Макаёнка (Карагандзінскі рус. т-р імя Станіслаўскага, 1961; Цалінаградскі краявы т-р, 1962), «Выклік багам» А. Дзялендзіка (Кустанайскі рус. т-р, 1967). Значны ўклад у развіццё нац. тэатр. мастацтва зрабілі нар. артысты СССР Ш. Айманаў і К. Куанышпаеў, нар. арт. Каз. ССР Ж. Шанін. Сярод тэатр. дзеячаў (1971): нар. арт. СССР Х. Букеева, нар. артысты Каз. ССР К. Бадыраў, Ш. Джандарбекава, Н. Жантурын, С. Кажамкулаў, К. Кармысаў, Р. Кайчубаева, С. Майканава, І. Нагайбаеў, М. Суртубаеў, С. Тэльгараеў, З. Шарыпава і інш.

Кіно. У 1925 адбыліся першыя хранікальныя здымкі (дакумент. фільм «Гадавіна КССР»). У 1934 у Алма-Аце арганізавана студыя кінахронікі. У 20—30-я г. на цэнтр. кінастудыях краіны з удзелам каз. акцёраў здымаліся фільмы пра жыццё Казахстана, этапныя — «Амангельды» (1939, рэж. М. Левін), дакумент. «Турксіб» (1929, В. Турын). Росту нац. кадраў садзейнічала Цэнтр. аб'яднаная кінастудыя (1942—44). У 1941 створана Алма-Ацінская кінастудыя маст. фільмаў, у 1944 студыя «Казахфільм». Пастаўлены гістар. і гісторыка-рэвалюц. фільмы: «Джамбул» (1953, Я. Дзіган), «Батагоз» (1958, Я. Арон), «Яго час прыйдзе» (1958, М. Бегалін), «Мы з Сямірэчча» (1959, С. Ходжыкаў і А. Очкін), «Трывожная раніца» (1966, А. Карсакбаеў). Фільмы на сучасныя тэмы: «Дзяўчына-джыгіт» (1955, П. Багалюбаў), «Наш мілы доктар» і «Зямля бацькоў» (1957, 1966, Ш. Айманаў) і інш. Значныя фільмы 60—70-х г.: «Сказ пра маці» (1964, А. Карпаў), «За намі Масква», «Песня пра Маншук» (1967, 1969, Бегалін), «Канец атамана» (1969, Айманаў), «Кыз Жыбек» (1970, Ходжыкаў).

Літ.: Бейсембаев С. Ленин и Казахстан (1897—1924), Алма-Ата, 1968; Матэрыялы XXIV з'езда КПСС, Мн., 1971; История Казахской ССР, т. 1—2, Алма-Ата, 1957—67; Аполлова Н. Г. Экономические и политические связи Казахстана с Россией в XVIII — начале XIX в., М., 1960; Бекмаханов Е. Б. Присоединение Казахстана к России, М., 1957; Дильмухамедов Е. и Маликов Ф. Очерки истории рабочего класса дореволюционного Казахстана. Вторая половина XIX — начало XX в., Алма-Ата, 1963; Сулейменов Б. Аграрный вопрос в Казахстане последней трети XIX — начала XX в., Алма-Ата, 1963; Елеулов Т. Установление и упрочение Советской власти в Казахстане, Алма-Ата, 1961; Баишев С. Б. Победа социализма в Казахстане, Алма-Ата, 1961; Казахстан в период Великой Отечественной войны Советского Союза 1941—1945. Сб. документов и материалов, т. 1—2, Алма-Ата, 1964—67; Казахстан, М., 1970 (Советский Союз); Народное хозяйство Казахстана. Статистический сб., Алма-Ата, 1968; Петрашкевич А. и Гудень Н. Победу одерживают мужественные (Об участии комсомольцев и молодежи Белоруссии в освоении целинных земель), Мн., 1961; История казахской литературы, в 3 т., Алма-Ата, 1968—71; История советской многонациональной литературы, в. 6 т., т. 1, 2 (ч. 1), 3, М., 1970—71; Каратаев М. Казахская литература, М., 1960; яго ж. От домбры до книги, М., 1969; Лизунова Е. Современный казахский роман, Алма-Ата, 1964; Писатели Казахстана, Алма-Ата, 1969; Казахские литературные связи. Библиогр. указатель, Алма-Ата, 1968; Акишев К. А. и Кушаев Г. А. Древняя культура саков и усуней долины реки Или, Алма-Ата, 1963; Акишев К. и Агеева Е. Древние памятники Казахстана, Алма-Ата, 1958; Маргулан А. Х., Басенов Т. К. и Мендикулов М. М. Архитектура Казахстана, Алма-Ата, 1959; Казахский народный орнамент. [Альбом], Алма-Ата, 1958; Нурмухаммедов Н. Б. Искусство Казахстана, М., 1970; Ерзакович Б. Г. Песенная культура казахского народа, Алма-Ата, 1966; Очерки по истории казахской советской музыки, Алма-Ата, 1962; Виноградов В. С. Музыка Советского Востока, М., 1968; Львов Н. И. Казахский театр. Очерк истории, М., 1961; Сиранов К. Киноискусство Советского Казахстана, Алма-Ата, 1966.

П. А. Лярскі (прырода). Магілёў; *А. Сабырханаў, К. Алдажумнаў* (гістар. нарыс), *І. Баранбаеў* (асвета, друк), *М. Каратаеў* (літаратура), *В. Р. Ерзаковіч* (музыка). Алма-Ата; *І. І. Трухан* (насельніцтва, гаспадарка), *І. У. Саламевіч* (бел.-каз. літ. сувязі). Мінск.

КАЗА́ХСКІ ДРАБНАСО́ПАЧНІК (Цэнтральна-Казахстанскі драбнасопачнік), моцна разбураная і згладжаная горная краіна ў цэнтр. і ва ўсх. частках Каз. ССР. Займае пл. больш за 500 тыс. *км²*. Утварылася ад працяглай дэнудацыі стараж. палеазойскага фундамента. Складзена з сланцаў, кварцытаў, пясчанікаў, вапнякоў і вывергну-

тых пород, якія месцамі перакрыты асадкавымі рыхлымі адкладамі.

У рэльефе К. д. вылучаюць зах. і ўсх. часткі, падзеленыя шырокай раўнінай палосай з вялізнымі ўпадзінамі, занятымі азёрамі (Тэнгіз і інш.). Усх. ч.— спалучэнні невялікіх адасобленых горных масіваў (Кызыларай, выш. да 1565 м, Каркаралы, выш. да 1403 м) і лагчын. Зах. ч. больш выраўненая. Клімат рэзка кантынентальны. Рэкі малаводныя і несудаходныя, толькі ў Ішыме, Нуры, Сарысу і інш. вада круглы год. Расліннасць стэпавая на Пн, паўпустынная на Пд. На схілах гор — хваёвыя лясы. Радовішчы медзі, свінцу, цынку, рэдкіх металаў, вугалю, жалеза.

Літ.: Казахстан, М., 1970 (Советский Союз).

КАЗАХСКІ УНІВЕРСІТЭТ імя С. М. Кірава, вышэйшая навучальная ўстанова. Заснаваны ў 1934 у Алма-Аце ў складзе фізіка-матэм. і біял. ф-таў. Імя Кірава прысвоена ў 1934. Ф-ты ў 1970/71 навуч. г.: гістар., філал., філас., журналістыкі, юрыд., механіка-матэм., фіз., хім., біял., геаграфічны. Навучанне дзённае, вячэрняе і завочнае. Ёсць аспірантура. Прымае да абароны канд. і доктарскія дысертацыі. У складзе ун-та аграбіялагічны, бат. сад, заалагічны і батанічны музеі, фундаментальная б-ка. Выдае «Вучоныя запіскі» (з 1938).

КАЗАХСТАН, гл. *Казахская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка.*

КАЗАЦКІ ЗАГОН, казацкі атрад, які не ўваходзіў у сталую войск. арг-цыю *казацтва.* Загоны дзейнічалі самастойна, у некат. выпадках падпарадкоўваліся казацкаму камандаванню. К. з., якія Б. Хмяльніцкі прысылаў на Беларусь у час *вызваленчай вайны ўкраінскага і беларускага народаў 1648—54*, адыгралі вялікую ролю, аб'ядноўваючы вакол сябе бел. сялян і гарадскую беднату, надаючы іх стыхійнай барацьбе супраць магнатаў і шляхты пэўную арганізаванасць.

Л. С. Абэцэдарскі. Мінск.

КАЗАЦТВА (цюрк. казак — вольны чалавек), прывілеяванае ваеннае саслоўе ў дарэвалюц. Расіі. Утварылася ў 15 ст. з сялян і пасадскіх людзей, якія ўцякалі ад феад. прыгнёту на малазаселеныя ўскраіны Рус. дзяржавы і Вял. кн. Літоўскага: запарожскае (на Дняпры), украінскае (у р-не Чаркасаў, Канева, па р. Рось, Паўд. Буг, Трубеж), данское, волжскае, церскае, грэбенскае (на Паўн. Каўказе), яіцкае (уральскае), сібірскае і інш.

К. ахоўвала граніцы, за гэта ўрад плаціў яму пенсію «за службу», даваў землі, боепрыпасы. К. стварыла сваю арыгінальную сац.-эканам., вайсковую і паліт. арг-цыю. Гал. рысы яе: адсутнасць прыгонніцтва, фармальна роўнае правы ўсіх членаў на карыстанне ямлёю, права ўдзелу ў вайск. радах, абавязак адбываць вайск. павіннасць на ўласны кошт. Найважн. пытанні вырашаў сход (вайск. рада, ці круг), які выбіраў старшыну-атаманаў і на інш. пасады. К. мела аўтаномію суда, кіравання і знешніх сувязей, якія царскі ўрад імкнуўся ліквідаваць. Гэта было адной з прычын паўстанняў С. Ц. Разіна, К. А. Булавіна, Е. І. Пугачова. У 18 ст. ліквідаваны выбарныя пасады К., старшыны атрымала афіцэрскія чыны, дваранскія званні і ператварылася ў памешчыкаў. Паступова К. афармілася як ваен. саслоўе, утварыўшы іррэгулярныя войскі, якія падпарадкаваліся ўраду. Да пач. 20 ст. ў Расіі існавала 11 казацкіх войск — Данское, Кубанское, Церское, Астраханское, Уральское, Аренбургское, Сямірэчанское, Сібірское, Забайкальское, Амурское, Усурыйское, якія адыгралі станоўчую ролю ў войнах Расіі 18 — пач. 20 ст. У 20 ст. царызм выкарыстоўваў казацкія часці для паліцэйскай службы, задушэння нац.-вызв. і рэвалюц. руху. У час Кастр. рэвалюцыі працоўнае і большасць франтавога К. перайшлі на бок Сав. улады. У 1918 бурж.-памешчыцкія элементы і інтэрвенты захапілі ўладу ў казацкіх раёнах і залучылі вял. частку К. ў стан контррэвалюцыі. Аднак палітыка Сав. улады, накіраваная на ўмацаванне саюзу рабочага класа і працоўнага К., супярэчнасці паміж К. і бурж.-памешчыцкай контррэвалюцыяй стварылі ўмовы для пераходу асн. масы К. на бок Сав. улады. На казацкія вобл. былі пашыраны законы РСФСР, што ліквідавала К. як прывілеяванае саслоўе, і працоўнае К. стала на шлях пабудовы сацыялізма.

Казацтва запарожскае склалася пераважна з укр. і бел. сялян, якія з 15 ст. ўцякалі ад феад. прыгнёту на Пд Украіны, за дняпроўскія парогі. Да спрэдзіны 16 ст. ўзнікла *Сеч Запарожская.* Заможныя вярхі звычайна займалі выбарныя камандныя пасады (старшына) і процістаялі родаваму К.— сіроме. Феадалы Рэчы Паспалітай пэўны час мірыліся з існаваннем К., якое стрымлівала агрэсію крымскіх татар і туркаў. У 2-й пал. 16 ст. К. выросла ў сілу, якая перашкаджала ўзмацненню феад. прыгнёту на Пд Украіны. Каб раскалоць К., найб. заможных казакоў упісалі ў асобны рэестр (1572) і далі некат. прывілеі, адначасова ўзмацнілі прыгнёт сялян і казакоў, якія не трапілі ў рэестр. Гэта паглыбіла супярэчнасці паміж старшынай і масамі К., якія супольна з сялянствам няраз паўставалі на барацьбу супраць феадальна-рэлігійнага прыгнёту: пад кіраўніцтвам С. Налівайкі, Т. Федаровіча (Трасілы), Я. Астраніна, Дз. Гуні і інш.

Вялікую ролю адыграла К. ў *вызваленчай вайне ўкраінскага і беларускага народаў 1648—54*, у выніку якой Украіна ўз'ядналася з Расіяй. Сярод К. многа выхадцаў з Беларусі (палкоўнікі Бутрым, Гаркуша, Грамыка, Крычэўскі, Хведаровіч і інш.). Казацкія атрады А. Нябабы, Міхненкі, Бута, Кемкі, Крывашапкі і інш. прыходзілі на Беларусь, вакол іх групаваліся бел. сяляне і гарадская беднота ў барацьбе з магнатамі і шляхтаю. Казацкія войскі пад камандаваннем І. Залатарэнкі змагаліся на Беларусі супраць войск Рэчы Паспалітай і ў *руска-польскую вайну 1654—67.* Пасля *Андрусаўскага перамір'я 1667* Запарожская Сеч трапіла пад уплыў Расіі. Класавыя супярэчнасці абумовілі ўдзел К. ў антыфеад. барацьбе. Баючыся ўзмацнення гэтай барацьбы, у 1765 царскі ўрад ліквідаваў ваен. арг-цыю слабодскага К., у 1775 зруйнаваў Запарожскую Сеч, ператварыў казакоў у асобную катэгорыю, блізкую да дзярж. сялян, а старшыну — у дваранства.

Літ.: Голобуцкий В. А. Запорожское казачество, Киев, 1957; Ягоў. Черноморское казачество, Киев, 1956; Шчарбакоў В. К. Сялянскі рух і казацтва на Беларусі ў эпоху феадалізму, Мн., 1935.

Л. С. Абэцэдарскі. Мінск.

КАЗАЧКОЎ Аляксей Лявонавіч [н. 12(25).2.1909, в. Віннаўка Сызранскага пав. Сімбірскай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). На фронце з 1941, камандзір гарматы. Вызначыўся ў Віцебскай вобл. 22—30.6.1944 разлік гарматы мал. сяржанта К. артыл. агнём падтрымліваў наступленне пяхоты, прыкрываў фарсіраванне

Зах. Дзвіны. Пераправіўшы гармату на левы бераг, знішчаў агнявыя кропкі праціўніка, гэтым спрыяў наступленню пяхоты. Жыве ў Куйбышаве.

КАЗАЧНІКІ, найболей даравітыя майстры расказваць народныя *казкі.* Асабістая творчая роля К., звязаная з іх жыццёвымі ўражаннямі, светапоглядам і талентам, выяўляецца і ў змесце, і ў форме традыц. казкі, у манеры выканання. Ад спалучэння слоўнай маст. тканіны з інтанацыямі жывога маўлення і выразнымі жэстамі, мімікай залежыць ідэйна-эмац. ўздзеянне казкі. Поруч з К.-аматарамі ў некат. краінах Усходу сустракаюцца К.-прафесіяналы, якія добра валодаюць нар. паэт. традыцыяй. На Русі ў эпоху феадалізму таксама былі прафес. майстры нар. казкі, напр. скамарохі. Яны ў пэўнай ступені развівалі традыцыйны ўсходне-славянскі казачны стыль.

Пра папулярных у бел. вёсках «балроў», што, як спрэдневяковыя мепестрэлі і скамарохі, «ходзяць з хаты ў хату гасцінных сялян і забаўляюць іх сваімі казкамі», ёсць звесткі ў аб. А. Глінскага «Польскі казачнік» (Вільня, 1853). У дарэвалюц. Беларусі казкі часта расказвалі на вячорках, куды запрашалі казачніка ці казачніцу. Часам вячоркі наладжвалі ў хаце казачніка. У калядны тыдзень, паводле звычаю, аднавяскоўцы збіраліся кожны вечар слухаць казкі найлепшых К. У «Смаленскім этнаграфічным зборніку» У. Дабравольскага (ч. 1, 1891) упершыню апубл. значны матэрыял для характарыстыкі індывідуальнага маст. стылю бел. казачніка В. *Міхайлава.* Таленавітыя К. заўсёды былі прадстаўнікамі перадавой часткі прац. народа. Казачнік П. *Гаспадароў* быў актыўным удзельнікам рэвалюц. сялянскага руху на Магілёўшчыне. У традыц. па форме чарадзейных казках ён надавычай глыбока адлюстраваў зрухі ў свядомасці бел. сялянства, выклікапыя рэв. 1905—07, і пар. пляавісць да паноў. Пра высокую культуру вуснапаэт. творчасці Бел. Палесся сведчаць прасякнутыя задушэўным лірызмам і пар. мудрасцю, напоўненыя новымі рэвалюц. ідэямі казкі і апавяданні *Рэдкага, І. Азёмшы,* М. Савіцкага, Д. Куляша, Р. Бохмата, М. Бохмачыхі і інш. Толькі частка багатага рэпертуару гэтых К. запісана і апубл. А. К. Сержпутоўскім. Самабытна развіваў сац. матывы ў бытавых казках А. *Вайчок* (Навагрудчына). Пад уплывам змен у пар. жыцці вусная казка страціла колішняе грамадскае значэнне. Аднак творчая дзейнасць пар. К. не скончылася. У Айч. вайну яна мела сувязь з гераічнай барацьбой за свабоду Сав. Радзімы. Стары пастух М. Багрым, найлепшы ў в. Даўляды Нараўлянскага р-на Гомельскай вобл. К., у 1943 расказваў дзівосны «сон» пра хуткае выгнанне акупантаў і перамогу Сав. Арміі, за гэта быў расстраляны эсэсаўцамі. У 60-я г. апубл. запісаныя пасля вайны казкі шэрагу таленавітых бел. К.: П. *Гулевіча* (Гомельская вобл.), М. *Спірыды* (Мінская вобл.), І. *Макея*, Ю. Ждановіч, І. *Мазалеўскага* (Гродзенская вобл.) і інш. Нашаму часу характэрны новыя працэсы нар. казкатворчасці, неадлучныя ад паступовага затухання фалькл. казачнай традыцыі. К. імкнуцца да псіхал. раскрыцця вобразаў, уводзяць у казку эпізоды сучаснага быту. Творчае мысленне К. і аўтараў літ. твораў абліялася. К. аменьваюць і дадумваюць фалькл. матывы ў духу літ. традыцыі. Уласпымі творамі К., а не творамі традыц. фальклору, з'яўляюцца такія новыя казкі, як «Ленінская праўда», «Як мужык-бядняк дабіўся сваёй праўды», «Пяць зярнят», якія пашыраюцца літ. шляхам. Творчае аблічча К. траціць сваю пэўнасць, бо казка ўсё больш выходзіць за межы вуснага нар. рэпертуару.

Літ.: Новиков Н. В. О проблеме традиционного и индивидуального в советской фольклористике, преимущественно в сказковедении, у кн.: Русский фольклор, в. 6, М.— Л., 1961, с. 63—80; Русская сказка. Избр. мастера. Ред. и коммент. М. Азадовского, т. 1—2, М., 1932; Сказки Ф. П. Господарева, Петрозаводск, 1941; Сержпутовский А. К. Сказки и рассказы белорусов-полешуков, СПб., 1911; Беларускія казкі, запісаныя ад Пятра Гулевіча, Мн., 1963; Барег Л. Р. Беларуская казка, Мн., 1969; Закарпатські казкі Андрія Калина, Ужгород, 1955; Hlučinský pohádkář Josef Smolka, Ostrava, 1958; Degh L. Märchen, Erzähler und Erzählgemeinschaft, Berlin, 1962.

Л. Р. Бараг. Уфа.

КАЗАЧУК Іван Фёдаравіч (н. 1913, в. Прылепча, Галіцыя), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1943. На фронце з 1943, камандзір узвода конпай разведкі. Вызначыўся 25.9.1943 у Камарынскім р-не Палескай вобл. З групай разведчыкаў пераправіўся цераз Дняпро і ў тыле праціўніка здабыў каштоўныя звесткі пра яго абарону і агнявыя сродкі. У ноч на 2.10.1943 на чале групы разведчыкаў нечаканым ударам знішчыў групу гітлераўцаў каля в. Галкі, гэтым садзейнічаў хуткаму наступленню батальёна. Жыве ў Чарнаўцах.

КАЗАЧЫНА, верхняе адзенне з аўчыны ці сукна. Шыецца накшталт *кажуха* ў талію. Тэрмін К. бытуе ў паўд.-ўсх. і цэнтр. частках Беларусі.

КАЗАЧЭНКА Васіль Паўлавіч [н. 12(25).3.1913, в. Новаархангельск Уманскага пав. Кіеўскай губ.], украінскі савецкі пісьменнік. Чл. КПСС з 1952. З сялян. Скончыў Кіеўскі ун-т (1938). У Айч. вайну ўдзельнік партызанскага руху. Друкуецца з 1938. Героіку Айчыннай вайны адлюстраваў у аповесцях «Цана жыцця» (1945), «Атэстат сталасці» (1946), «Сэрца маці» (1946), «Гарачыя рукі» (1960), «Бліскавіца» (1962, Рэсп. камсамольская прэмія імя М. Астроўскага 1963), «Лісты з патрона» (1967). Аповесці «Новыя Патокі» (1948) і «Зары насустрач» (1951) пра жыццё пасляваен. укр. вёскі, «Сальвія» (1956) пра мараль і быт сав. інтэлігенцыі. Аўтар зб. апавяд. пра сучасную Амерыку «Нью-Йорк аблізку» (1958). Пераклаў на ўкр. мову раманы І. Шамякіна «Глыбокая плынь», Я. Брыля «Птушкі і гнёзды», п'есы А. Макаёнка «Лявоніха на арбіце», «Зацюканы апостал», апавяданні К. Чорнага, Я. Брыля, І. Мележа, П. Пестрака. Першы нам. старшыні праўлення СП УССР (з 1971). На XXIV з'ездзе КПУ выбраны чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета УССР 7—8-га скл. Дзярж. прэмія УССР імя Шаўчэнкі 1971. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Кастр. Рэв., 2 інш. ордэнамі, медалямі.



Тв.: Творы, т. 1—2, Кіеў, 1963; бел. пер.— Атэстат сталасці, пер. Я. Брыля, Мн., 1956; у час.: «Беларусь», 1954, № 12; рус. пер.— Цена жизни.— Молния.— Горячие руки, М., 1964.

Літ.: Пінчук С. Василь Козаченко, Київ, 1963.

В. А. Чабаненка. Запарожжа.

КАЗАЧЭНКА Мікалай Міхайлавіч [н. 19.12.1915 (1.1.1916), в. Бярозаўка Ігуменскага пав. Мінскай губ.], Герой Сав. Саюза (1943). З сялян. Чл. КПСС з 1944. Скончыў Рэсп. парт. школу пры ЦК КП(б)Б (1949). У Айч. вайну



на Паўн.-Каўказскім, 2-м і 3-м Укр. і 1-м Бел. франтах. Удзельнік абароны Масквы. Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра каля Краменчуга. Ноччу 3.10.1943 з байцамі свайго аддзялення збудаваў прыстань на правым беразе і пераправіў на пароме 1700 воінаў, 60 фурманак з боепрыпасамі, 120 коней і 620 скрынак з амуніцыяй. Жыве ў Мінску.

КАЗБЕГІ Аляксандр [8(20).1.1848, в. Сцепанцмінда (Казбегі) — 10(22).12.1893], грузінскі пісьменнік. З дваран. Друкавацца пачаў у 1880. Раман «Элгуджа» (1881) пра барацьбу горскіх сялян за свабоду (першае асобнае выд. канфіскавана і спалена паліцыяй). Аўтар аповесцей «Элісо» (1882), «Ціко» (1883), «Хевісберы Гоча» (1884) і інш., п'ес («Адзін з пяцярых», паст. 1880; «Раніца пасля вяселля»; «Арсен», паст. 1882; і інш.). Выкрываў бяспраўствы феадалаў і царскіх чыноўнікаў, паказваў духоўную веліч і харство простых людзей. Рамант. прыўзнятасць стылю ў К. чаргуецца з рэаліст. бытавымі малюнкамі. Майстар паказу пейзажу, прасякнутага глыбокімі перажываннямі. Пераклаў на груз. мову «Гора ад розуму» А. Грыбаедава, «Рамэо і Джульету» У. Шэкспіра, паасобныя вершы М. Лермантава і інш.



Тв.: Рус. пер.— Избр. произв., т. 1—2, Тбилиси, 1957; Отцеубийца, Тбилиси, 1964; Элисо. Повести и рассказы, М., 1964.

Літ.: Джибладзе Г. Романтики и реалисты в грузинской литературе XIX в., пер. с груз., Тбилиси, 1963.

КАЗЕІН (лац. caseus сыр), складаны бялок — фосфапратэід, у якім рэшткі фосфарнай кіслаты ўтвараюць складаны эфір з гідраксільнай групаю серыну.

Малекулярная маса 70—100 тыс. Растворацца ў разбаўленых шчолачах і ў водных растворах соляў. Неаднародны, можа дзяліцца на α-, β- і γ-К., якія розняцца паміж сабою амінакіслотным саставам і фізіка-хім. ўласцівасцямі. Састаўная частка малака, тварагу, сыру, брынзы (каровіна малако мае 2,5—4,5% К.). Адзін з галоўных бялкоў яды (мае ўсе незаменныя для жыўлення арганізма амінакіслоты). Выкарыстоўваецца таксама ў вытв. пластмас, штучнага валакна, клею.

Літ.: Ипихов Г. С. Биохимия молока, М., 1956 (бібліягр.); Филиппович Ю. В. Основы биохимии, М., 1969; Гауровиц Ф. Химия и функции белков, пер. с англ., М., 1965.

В. К. Васільеўіч. Мінск.

КАЗЕЙ Арыядна Іванаўна (н. 23.12.1925, в. Станькава Койданаўскага р-на Мінскай акр.), беларускі савецкі педагог. Герой Сац. Працы (1968). Засл. настаўніца Беларускай ССР (1965). Чл. КПСС з 1964. Скончыла Мінскі пед. ін-т імя М. Горкага (1954). Удзельніца партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну (партызанка партыз. брыгады імя Ракасоўскага). Сястра Героя Сав. Саюза Марата *Казея*. Працуе ў Мінску.

КАЗЕЙ Марат (Марат Іванавіч; 29.10.1929, в. Станькава Койданаўскага р-на Мінскай акругі — 11.5.1944), Герой Сав. Саюза (1965), юны партызан-разведчык. У партызанах з ліст. 1942 — разведчык *партызанскай брыгады 200-й* імя К. К. Ракасоўскага Мінскай вобл. Удзельнік баёў у Станькаўскім лесе (9.1.1943), на Слуцкай шашы (снеж. 1943), дзе здабыў каштоўныя варожыя дакументы — ваен. карты і планы камандавання. У маі 1944 у в. Хароміцкія Уздзенскага р-на, куды быў накіраваны ў разведку К., уварваліся карнікі, адкрылі агонь па разведчыку, які адступаў, забілі пад ім каня. К. залёг у хмызняку і адстрэльваўся да апошняга патрона, потым гранатай падарваў сябе і зніштчыў некалькіх гітлераўцаў. У 1959 у Мінску на сродкі піянераў рэспублікі пастаўлены помнік К. (скульптар С. І. Селіханаў). Яго імем названы вуліцы ў многіх гарадах Беларусі, школы, піянерскія дружыны.



Літ.: Морозов В. Н. В разведку шел мальчишка, Мн., 1965; Ягож. Им было по четырнадцать, Мн., 1969.

КАЗЕКА Янка [Іван Дарафеевіч; н. 18(31).8.1915, в. Кострычы Бабруйскага пав. Мінскай губ.], беларускі савецкі крытык і літаратуразнавец. Чл. КПСС з 1942. З сялян. Скончыў Мінскі пед. ін-т (1938). У 1938—39 настаўнік. З 1939 у Чырв. Арміі. Удзельнік Айч. вайны. Працаваў у рэд. газ. «Літаратура і мастацтва» (1954—57), гал. рэдактарам выд-ва «Беларусь» (1957—67). З 1967 у Галоўнай рэдакцыі БелСЭ (з 1969 нам. гал. рэдактара). Друкуецца з 1935. Даследуе маст.-стылёвыя асаблівасці бел. прозы, ролю пісьменніцкай індывідуальнасці ў літ.-творчым працэсе (Я. Колас, К. Чорны, К. Крапіва, В. Вітка, В. Каваль, І. Мележ і інш.), пытанні сатыры, вытокі і развіццё жанру байкі ў бел. літаратуры.

Тв.: З невычэрпных крыніц, Мн., 1958; Беларуская байка, Мн., 1960; Натхненне і майстэрства, Мн., 1963; Кандрат Крапіва, Мн., 1965; Васіль Каваль, «Полымя», 1966, № 1.

І. Я. Навуменка. Мінск.

КАЗЕКІ, вёска ў Дуброўскім с/с Аршанскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Дубраўка». За 18 *км* на ПдЗ ад Оршы, 104 *км* ад Віцебска, 7 *км* ад чыгуначнай станцыі Копысь. 137 ж., гасп. 46 (1971). Васьмігадовая школа.

КАЗЕЛКА Канстанцін Кандратавіч [н. 9(22).10.1915, ст. Калінкавічы Мазырскага пав. Мінскай губ.], беларускі савецкі майстар-разьбяр па дрэве. Засл. дз. маст. БССР (1957). Разьбой займаецца з 1946. Тэмы твораў: гераічнае

мінулае сав. народа, яго праца, сюжэты з фальклору, літаратурных твораў, сучаснага жыцця. Сярод работ: «Віцязь» (1948), «Аляксандр Неўскі», «Суворaў», «Хлопчык з ногцік» (усе 1949), «У У. І. Леніна» (1953), «Багдан Хмельніцкі», «Руслан і Рагдай», «Салават Юлаеў» (усе 1954), «Героі Брэста», «Беларусы едуць» (абодва 1957), «Цялятніца» (1958), «За ўладу Саветаў» (1959), «Будзёнаўцы» (1962), «Тачанка» (1965). З 1945 жыве ў Давыд-Гарадку. У Дзяржаўным мастацкім музеі БССР 4 работы К., у Дзяржаўным музеі БССР — 37.



К. К. Казелка. Руслан і Рагдай. Дрэва. 1954. Рэспубліканскі дом народнай творчасці.

Ф. І. Валадзько. Мінск.

«КАЗЕЛ» («Каза», «Казачка»), беларускі народны танец. Мае вытокі ў стараж. абрадавым (на каляды) хаджэнні з *«казою»*. Муз. памер $^2/_4$, у аснове харэаграф. малюнка — імітацыя падскокаў і тупату коз. Выконваецца звычайна з прыпеўкамі. Бытавала мноства варыянтаў, некат. з элементамі ігравога дзеяння, акрабатыкі.

КАЗЁННАЕ, возера ў бас. Лучосы, левага прытока Зах. Дзвіны, у Дубровенскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 1,18 *км*². Даўж. 3,7 *км*, найб. шыр. 0,5 *км*, сярэднял 0,3 *км*. Катлавіна выцягнута з ПнЗ на ПдУ. Схілы высокія, часткова пераслі лесам. 9 а-воў. Вадазбор (151 *км*²) пераважна нізінны, значна забалочаны і аблесены. У К. ўпадае р. Лютыня і некалькі ручаёў, праз возера працякае р. Вярхіта. Водзяцца плотка, акунь, шчупак, верхаводка, лешч, джгір.

КАЗІМІР III Вялікі (Kazimierz III Wielki; 30.4.1310—5.11.1370), польскі кароль [1333—1370]. Апошні з дынастыі Пястаў. Вядомы сваёй палітыкай умацавання і цэнтралізацыі дзярж. улады. Выдаў Віслицка-Петракоўскія статуты 1347, якія сведчылі пра ўмацаванне феад. манархіі. Абмяжоўваў уплыў Германіі на польскія гарады. Ваяваў з Тэўтонскім ордэнам, у 1343 вярнуў Польшчы Куявію, але аддаў Усх. Памор'е. Вёў захопніцкую палітыку на У. Падначаліў Галіцкую Русь (1349). Пры ім засн. Кракаўскі ун-т (1364).

КАЗІМІР IV Ягелончык (1427—92), вялікі князь Вял. кн. Літ. з 1440 і кароль Польшчы з 1447. Унутр. палітыка К. IV была накіравана на ўмацаванне вялікакняскай улады, далейшае запрыгоньванне сялян і расшырэнне правоў феадалаў. У 1441 задушыў паўстанне смаленскіх гараджан, у 1490—92 — укр. і малд. сялян. У 1447 выдаў прывілей (гл. *Казіміраў прывілей 1447*), якім расшырыў правы феадалаў Вял. кн. Літ., у 1454 выданнем Нешаўскіх статутаў замацаваў паліт. панаванне шляхецкага саслоўя ў Польшчы, пры ім узмацніўся ўплыў рады паноў у Вял. кн. Літ. Дзейнасць К. IV выклікала супраць яго змову праваслаўных князёў Міхаіла Алелькавіча, Івана Гальшанскага і Фёдара Бельскага, якая была раскрыта і задушана ў 1481. У 1468 выдаў судзебнік, які быў першай спробай кадыфікацыі феад. права ў Вял. кн. Літ. У знешняй палітыцы імкнуўся да захавання тарытарыяльнай цэласнасці дзяржавы. Вярнуў у склад Вял. кн. Літ. Дарагічынскую зямлю (1444), захопленую раней Польшчай, захаваў у складзе Вял. кн. Літ. Валынь, якой дамагаліся польскія феадалы, у 1471 канчаткова ліквідаваў удзельнае Кіеўскае княства. У выніку вайны з Тэўтонскім ордэнам (1454—66) Польшча вярнула Памор'е і Зах. Прусію, ордэн трапіў у васальную залежнасць ад Польшчы.

Літ.: Белоруссия в эпоху феодализма. Сб. документов и материалов, т. 1, Мн., 1959; Законодательные акты Великого княжества Литовского XV—XVI вв., Л., 1936; Пресняков А. Е. Лекции по русской истории, т. 2, в. 1 — Западная Русь и Литовско-Русское государство, М., 1939, с. 140—158.

С. А. Шчарбакоў. Мінск.

КАЗІМІРАЎ ПРЫВІЛЕЙ 1447, заканадаўчы акт Казіміра IV пра эканам. і паліт. правы пануючага класа. Феадалам Літвы, Украіны і Беларусі гарантаваў права ўласнасці на зямлю, права судзіць залежных ад іх людзей, выязджаць за мяжу. Зямлю, дзярж. пасады, ганаровыя чыны і званні ў Вял. кн. Літ. маглі атрымліваць толькі феадалы. Гэтым мелася на мэце не дапусціць пранікнення ў княства польскіх феадалаў і захаваць яго самастойнасць. Даў пачатак юрыд. афармленню залежнасці сялян ад феадалаў, забараніў феадалам прымаць «чужых» сялян.

Кр.: Белоруссия в эпоху феодализма. Сб. документов и материалов, т. 1, Мн., 1959, с. 124—127.

І. А. Юхо. Мінск.

КАЗІМІРАЎКА, вёска ў Пашкаўскім с/с Магілёўскага р-на. Цэнтр калгаса імя Валадарскага. За 5 *км* на ПнЗ ад Магілёва, на аўтамаб. дарозе Магілёў — г. п. Бялынічы. 1564 ж., гасп. 374 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання, раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячы сад, фельч.-ак. пункт, адд. сувязі, магазін. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

КАЗІМІРОВА, вёска ў Вялікадолецкім с/с Ушацкага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Новае жыццё». За 31 *км* на ПдЗ ад Ушачаў, 140 *км* ад Віцебска, 25 *км* ад чыг. ст. Лепель. 80 ж., двароў 23 (1971). Сярэдняя школа, дзіцячыя яслі. Помнік 86 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

КАЗІМІРОЎСКІ Саламон Савельевіч [н. 15(28).4.1915, Бабруйск], беларускі і рускі савецкі рэжысёр. Чл. КПСС з 1940. Скончыў Дзярж. ін-т тэатр. мастацтва імя Луначарскага (1940). У 1941—48 у Сав. Арміі. Працаваў у т-рах РСФСР. У 1940—41 рэж., з 1967 гал. рэж. т-ра імя Я. Коласа. Пастаноўкі ў т-ры імя Я. Коласа: «Лекар паняволі» Мальера (1940), «Шо-

стага ліпеня» М. Шатрова (1967, Дзярж. прэмія БССР 1968), «Зыкавы» М. Горкага (1968), «Слуга двух гаспадароў» К. Гальдоні (1969), «Трэцяя патэтычная» М. Пагодзіна і «Трыбунал» А. Макаёнка (1970), «Многа шуму з нічога» У. Шэкспіра (1971), «Багна» А. Астроўскага (1972). Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі.

КАЗІНЕЦ Ісай Паўлавіч (Слава Юрыгін, Слаўка Пабядзіт; 1910, Батум — 7. 5.1942), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў *Мінскага камуністычнага падполля* ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1965). З рабочых. Чл. КПСС з 1938. З першых дзён акупацыі Мінска ўключыўся ў барацьбу супраць ням.-фаш. захопнікаў, стварыў падпольную парт. групу ў Кастрычніцкім р-не Мінска. У ліст. 1941 — сак. 1942 сакратар Мінскага гар. падпольнага к-та КП(б)Б, які наладзіў сувязь з партыз. атрадамі, узначаліў некаторыя падпольныя групы, якія дзейнічалі ў горадзе, у падпольнай друкарні выдаваў лістоўкі, перыядычны лісток *«Вестник Родины»*. 27.3.1942 гітлераўцы арыштавалі К. і пасля катаванняў павесілі. Яго імем названа вул. ў Мінску, на доме, дзе жыў К., мемарыяльная дошка.



Літ.: Давыдова В. и Щербаков А. «Славка Победит», у кн.: Люди легенд, в. 3, М., 1968; Дорога в бессмертие, Мн., 1967, с. 108—129.

В. С. Давыдава. Мінск.

КАЗІНОВА, гарадзішча *днепра-дзвінскай культуры* і тыпу верхняга пласта *Банцараўшчыны* каля в. Казінова Гарадоцкага р-на Віцебскай вобл., на беразе р. Усысы. Даследавалі А. М. Ляўданскі, Л. В. Аляксееў, К. П. Шут. Пры раскопках знойдзены рэшткі гладкасценнай керамікі, жалезныя прылады працы, глінянае прасліца, а таксама абломкі посуду 5—8 ст. Побач з гарадзішчам паселішча культуры тыпу верхняга пласта Банцараўшчыны.

Літ.: Шут К. П. Памятники раннего железного века на севере Белоруссии, у кн.: Древности Белоруссии, Мн., 1966.

КАЗКА, адзін з асноўных і самых пашыраных жанраў народна-паэтычнай творчасці, а таксама пісьмовай літаратуры; вусны апавядальны сюжэтны твор незвычайнага зместу, які звязаны з сац. бытам і грунтуецца на займальнай выдумцы. Выяўляе маральныя і сац. погляды нар. мас, іх ідэалы, мары, якія перавышаюць дасягнутае ў пакарэнні сіл прыроды і ў стваральнай працы. Арганічна спалучае традыцыйнае і новае, нацыянальнае і міжнароднае, асаблівасці калектыўнай і індывід. творчасці, майстэрства слова і драматызаванага выканання. Вытокі жанру К.— у рэчаіснасці дакласавага грамадства, а паасобныя сюжэты фарміраваліся ў розныя эпохі і з'яўляюцца своеасаблівымі гістар. напластаваннямі. Падабенства казачнай творчасці многіх народаў свету абумоўлена агульнымі сац. закамернасцямі іх жыцця і мае тыпалагічны характар. З развіццём міжнар. культурных сувязей адбываецца ўзаемаабмен вуснымі і літаратурна апрацаванымі К. Творчае асваенне нар. *казачнікамі* фальклорнага матэрыялу інш. нацыянальнасцей залежыць ад канкрэтнай рэчаіснасці і нац. фалькл. традыцый. У К. сваяцкіх народаў, напр. беларусаў, рускіх і ўкраінцаў, адлюстравалася адзінства іх паходжання і лёсу. Гістар. і геагр. становішча Беларусі вызначыла яе ролю як звяна паміж рус., укр., польскай і прыбалт. культурнымі традыцыямі. Гэта па-свойму выявілася ў багацці бел. казачнага рэпертуару, у разнастайнасці варыянтаў яго сюжэтаў. Ва ўмовах патрыярх. быту бел. сялянства К. заняла ці не самае выдатнае месца сярод інш. жанраў фальклору. Гэта часткова звязана з тым, што традыцыі песеннага эпасу Кіеўскай Русі пасля яе распаду не атрымалі на Беларусі такога развіцця, як у Маскоўскай Русі або на Украіне, дзе ролю нац. цэнтра пэўны час адыгрывала Запарожская Сеч, якая стала таксама цэнтрам фарміравання ўкр. гістар. эпасу — *дум*. Масавая казкатворчасць дасягнула ў дарэвалюц. Беларусі вельмі высокага маст. ўзроўню. Выдатныя нар. казачнікі, напр. *Рэдкі* і П. *Гаспадароў*, выступалі як папулярныя майстры слова і своеасаблівыя філосафы, публіцысты. У іх казках ярка адлюстраваўся пачатак свядомай паліт. барацьбы сялянства царскай Расіі і вопыт, набыты ім у перыяд рэв. 1905—07. У сав. час вусная казачная традыцыя паступова затухае пад уплывам усеагульнай пісьменнасці, маст. л-ры, радыё і тэлебачання. Савецкімі бел. нар. казачнікамі створаны К. на паліт. тэмы («Ленінская праўда» і інш.). Падобныя творы стаяць як бы на мяжы фалькл. і літ. творчасці. Бел. нар. К. вядомыя пераважна па зборніках 19 — пач. 20 ст. Іх запісвалі М. Дзмітрыеў, П. Шэйн, Е. Раманаў, У. Дабравольскі, М. Федароўскі, А. Сержпутоўскі і інш.

Жанравыя разнавіднасці нар. К. разнастайныя. Асаблівасці жанру найпаўней раскрываюцца ў чарадзейнай К. У ёй дзівоснае — рухач дзеяння. Фантаст. незвычайнасці зместу адпавядае кампазіцыйная і стыліст. форма чарадзейнай К. Самыя папулярныя сюжэты бел. чарадзейных К. папулярныя таксама ў рус. і ўкр. нар. асяроддзі. Чарадзейных

«Кот Максім» (выд. 1958, вокладка, маст. М. Ф. Карпенка). «Два маразы» (выд. 1965, вокладка, маст. І. Р. Някрасаў).







«Цудоўная дудка» (выд. 1967, ілюстрацыя, маст. М. Ц. Гуціеў).

сюжэтаў бел. казак, якіх няма ў фальклоры інш. народаў, нямала, але гэта найчасцей адзінкавыя запісы. Самабытнасць К. залежыць не ад таго, наколькі рэдкі яе сюжэтны тып, а ад усяе ідэйна-маст. структуры гэтага тэксту, варыянта. Бел. фантаст. традыцыйныя К. вылучаюцца насычанасцю антыпамешчыцкімі, антыкулацкімі і інш. сац. матывамі, звязанымі з бел. гістар. рэчаіснасцю, а таксама з адлюстраваннем сац. зрухаў у свядомасці сялянства. Ім нярэдка ўласціва глыбокая маральна-філас. гуманіст. накіраванасць. Ярка вылучаюцца ў бел. казачным матэрыяле чарадзейныя К. пра асілкаў. У сваім развіцці яны ўзаемадзейнічалі з папулярнымі ў дарэвалюц. Беларусі паданнямі і легендамі пра асілкаў-волатаў, якім часткова ўласцівы былі функцыі гераічнага эпасу. Яны ўвабралі ў сябе некат. матывы былін. У бытавой К.— навелістычнай і сатырычнай — незвычайнае па-мастацку абагульняецца ў будзённых справах. З распадам патрыярхальнага быту і развіццём класавай барацьбы расло ў нац. рэпертуары значэнне К., героі якіх вызначаюцца канкрэтнасцю сац. вобліку, кампазіцыя — свабодай і дынамічнасцю, склад — прастатою. Самабытнасцю вылучаюцца апубл. А. Сержпутоўскім навелістычныя К. бел. Палесся «Дзяўчына», «Не сіла, а смеласць». Развіццё сюжэта і паэт. жаночых вобразаў падпарадкавана ў іх ідэям пра высакародны ўплыў прыгажосці чалавека, пра перавагу смеласці над сілай. Шэдэўрамі вуснай творчасці з'яўляюцца і сатыр. К. зборнікаў Сержпутоўскага «Пану навука» і «Мужык і пан». У іх вельмі жыва, у адпаведнасці з рэальнай бел. рэчаіснасцю раскрываюцца вобразы бессардэчных, фанабэрыстых і маральна нікчэмных паноў і кемлівых, дасціпных і смелых мужыкоў — непрымірымых ворагаў прыгнятальнікаў. Займальная ўмоўнасць, незвычайная жыццёвасць і ўстойлівая лаканічная форма — характэрныя рысы К. пра жывёл. К. пра жывёл стала ў фальклоры народаў Еўропы амаль выключна дзіцячай. Нац. адметнасць К. пра жывёл звязана з дэталямі, якія поўнасцю можна адчуць толькі ў цэласным іх сюжэтным выражэнні, напр. у бел. К. пра коціка, пеўніка і лісіцу (зб. «Могилевская старина», 1903), дзе дзеянне разгортваецца на фоне бел. пейзажу і ў адпаведнасці з бел. бытам: кот іграе на скрыпцы калядку, як нар. музыка на каляды. Прыкладам майстэрства слова можа служыць К. «Помста дзятла» (зб. П. Шэйна, 1893). Тут гумарыстычна намаляваны характары лжывай і нахабнай драпежніцы-лісы і лагоднага, даведзенага да адчаю дзятла. У бел. фальклоры побач з мноствам міжнар. сюжэтаў пра жывёл ёсць і такія, якіх няма ў фальклоры інш. народаў («Бык і ваўкі», «Чаму ваўкі званка баяцца», «Жаніцьба мядзведзя на вавёрцы» і інш.). Легендарная К., якая часткова адносіцца да жанру легенды, займае адносна вялікае месца ў традыц. бел. рэпертуары. Яе фантастыка звязана з вобразамі хрысціянскіх святых, бога, анёлаў і чарцей, а дзеянне разгортваецца і на зямлі, і на «тым свеце». Ярка выражаная маральная накіраванасць такіх бел., рус. і ўкр. К. нярэдка зусім пазбаўлена рэліг. дыдактызму і звязана з іх сац. сатыр. завостранасцю. Характэрная ў гэтых адносінах бел. К. «Суддзя праведны» (зб. У. Дабравольскага, 1891). Гуманіст. пафас, з якім маральна чысты, непадкупны нар. герой выказвае сумненне ў бескарыслівасці святых і ў праведнасці самога бога, пераходзіць у едкую іронію над царк. вучэннем, у страсны пратэст супраць грамадскай несправядлівасці. У шмат якіх бел. легендарных К. у трактоўцы вобразаў святых і бога выявілася супярэчлівасць светапогляду дарэвалюц. патрыярх. сялянства. Фантазія перадавых нар. казачнікаў, якіх хвалявалі праблемы шчасця і зла, узбуджалася пад уплывам рэвалюц. падзей і вызваленчых ідэй (гл. К. «З чаго ліха на свеце», зб. Сержпутоўскага, 1911). Часткова да фантаст., часткова да бытавых далучаюцца анекдатычныя К. пра дурнога чорта. Як і ў бытавых К., у іх дзівоснае не адыгрывае асн. ролі ў развіцці дзеяння. У бел. і ўкр. фальклоры сюжэтных тыпаў такіх К. больш, чым у рускім. Ёсць у бел. фальклоры К. глыбокага сац. зместу, у якіх сюжэт пра дурнога чорта ўскладняецца легендарнымі эпізодамі або зліваецца з легендамі пра паходжанне балотаў, лясоў і г. д., напр. «Злодзей, пан і чорт» (зб. Шэйна, 1893), «Паляшук і чорт», «Чортава балота» (зб. Сержпутоўскага, 1911). Літаратурная К.— гэта нар. К., апрацаваная пісьменнікам або створаная ім па матывах нар. К. (напр., казкі Я. Коласа, З. Бядулі, У. Дубоўкі, А. Якімовіча, М. Танка, А. Пушкіна, Л. Талстога, А. Талстога і інш.). Бел. нар. К. выдадзены на многіх мовах народаў СССР і за мяжою.

Беларускія народныя казкі, выдадзеныя ў Празе (1957) і Берліне (1970).





Публ.: Романов Е. Р. Белорусский сборник, в. 3, Витебск, 1887, в. 4, Витебск, 1891, в. 6, Могилев, 1901; Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края, т. 2, СПб., 1893; Добровольский В. Н. (сост.). Смоленский этнографический сборник, ч. 1, СПб., 1891; Сержпутовский А. К. Сказки и рассказы белорусов-полешуков, СПб., 1911; яго ж. Казкі і апавяданні беларусаў з Слуцкага павета, [Мн.], 1926; Казкі і легенды роднага краю, Мн., 1960; Казкі пра жывёл і чарадзейныя казкі, Мн., 1971; Беларускія казкі, запісаныя ад Пятра Гулевіча, Мн., 1963; Federowski M. Lud białoruski, t. 1—3, Kraków, 1897—1903; Belorussische Volksmärchen, 4 Aufl., Berlin, 1970.

Літ.: Пропп В. Я. Морфология сказки, 2 изд., М., 1969; яго ж. Исторические корни волшебной сказки, Л., 1946; Мелетинский Е. М. Герой волшебной сказки, М., 1958; Белинский В. Г. О народных сказках, Полн. собр. соч., т. 5, М., 1954; Добролюбов Н. А. [Рэц.]: «Народные русские сказки». Издал А. Афанасьев, в. 3 и 4, М., 1858..., Собр. соч., т. 3, М.—Л., 1962; Горький М. О сказках, у кн.: Книга тысячи и одной ночи, т. 1, М.—Л., 1958; Померанцева Э. В. Судьбы русской сказки, М., 1965; Савченко С. В. Русская народная сказка, Киев, 1914; Бараг Л. Р. Беларуская казка, Мн., 1969; яго ж. Об особенностях украинской сказочной героики сравнительно с белорусской и русской, у кн.: Русский фольклор, в. 11, М.—Л., 1968; Фядосік А. С. Беларуская народная сатырычная проза, Мн., 1969; Кабашнікаў К. П. Беларуская казка ў казачным эпасе славян, Мн., 1968; Беларуская народная вуснапаэтычная творчасць, Мн., 1967; Андреев Н. П. Указатель сказочных сюжетов по системе Аарне, Л., 1929; Саламевіч І. У. (скл.). Беларускі фальклор (1926—1963). Кароткі бібліягр. даведнік, Мн., 1964; Thomp-

son S. The types of the folktale, 2 ed., Helsinki, 1961; Röhrich L. Märchen und Wirklichkeit, 2 Aufl., Wiesbaden, 1964; Polívka J. Slovanské pohádky, [dl.] 1, Praha, 1932. *Л. Р. Бараг.* Уфа.

КАЗЛАБАРОД (Tragopogon), род двух- і шматгадовых травяністых раслін сям. складанакветных. Вядома каля 150 відаў, пашыраных у Еўропе, Азіі, Міжземнамор'і. У СССР каля 90 відаў, на Беларусі 5.



Казлабарод вялікі: *1* — агульны выгляд расліны; *2* — сямянка з чубком.

Сцябло раслін простае ці разгалінаванае, выш. 25—80 см. Лісце цэласпакрайняе лінейнае або ланцэтнае. Кветкі пераважна жоўтыя, сабраныя ў кошыкі. Плод — сямянка з чубком. На Беларусі (на лугах, у хмызняках, каля дарог) вядому пападаюцца віды: К. беларускі (T. bjelorussicus), К. вялікі (T. majus), К. усходні (T. orientale), К. лугавы, казлок (T. pratense), К. украінскі (T. ucrainicus). Большасць відаў К. меданосы; добра пападаюцца жывёлаю. Карані багатыя на інулін.

Літ.: Флора БССР, т. 5, Мн., 1959.

КАЗЛАНЮК Пятро Сцяпанавіч [30.7(12.8).1904, в. Пярэрыў Снятынскага пав., Галіцыя — 19.3.1965], украінскі сав. пісьменнік і грамадскі дзеяч. Чл. КПСС з 1943. З сялян. Вучыўся ў Каламыйскай гімназіі. У 20—30-я г. журналіст. За рэвалюц. дзейнасць арыштоўваўся ўладамі бурж. Польшчы. Адзін з арганізатараў Антыфаш. кангрэсу ў Львове (1936). Друкавацца пачаў у 1926. У апавяданнях, памфлетах, фельетонах, артыкулах адлюстроўваў жыццё і рэвалюц. барацьбу народа Зах. Украіны пры панскай Польшчы, паказваў новае жыццё пасля ўз'яднання 1939, выкрываў рэакц. сутнасць укр. бурж. нацыяналізму. Аўтар рамана-трылогіі «Юрко Крук» (1946—56), аповесці-казкі «Вандроўнікі» (1946), п'есы «Запраданцы» (1945), апавяданняў для дзяцей. У 1944—65 старшыня Львоўскай арг-цыі СП Украіны. На бел. мову творы К. пераклі Я. Брыль, А. Клышка. Дэп. Вярх. Савета СССР 3—5-га скл. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі.

Тв.: Твори, т. 1—3, Київ, 1960; бел. пер. у час.— «Беларусь», 1957, № 6, «Полымя», 1964, № 9; рус. пер.— Избранное, т. 1—2, М., 1960.

Літ.: Байда Ю. Петро Козланюк, Київ, 1959; Про Петра Козланюка, Київ, 1964; Гуменюк М. П. Петро Козланюк. Бібліогр. покажчик. 2 вид., Львів, 1957. *В. А. Чабаненка.* Запарожжа.

КАЗЛОВА Марыя Васілеўна (н. 19.5.1922, в. Галовінцы Гомельскага пав.), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1971). У 1946—59 даярка калгаса імя Чапаева Гомельскага р-на, з 1959 даярка саўгаса «Бярозкі» гэтага ж р-на.

КАЗЛОВА Паліна Фёдараўна (н. 8.3.1928, в. Сідаравічы Чачэрскага р-на Гомельскай акругі), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1967. У 1944—63 цялятніца, даярка; з 1963 свінарка саўгаса «Сож» Чачэрскага р-на Гомельскай вобл. Дэп. Вярх. Савета БССР 8-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Кастр. Рэвалюцыі, медалямі.

КАЗЛОВА Раіса Якаўлеўна (н. 22.2.1928, Рузаеўка Мардоўскай акругі), перадавік прамысловасці, Герой Сац. Працы (1960). Чл. КПСС з 1956. У 1945—50 на Рузаеўскай трыкатажнай ф-цы, з 1950 электразваршчыца Гомсельмаша. На XXIV—XXV з'ездах КПБ выбрана чл. ЦК.

КАЗЛОВІЧЫ, вёска ў Чарнаўчыцкім с/с Брэсцкага р-на, на правым беразе р. Лясной. Цэнтр саўгаса «Світанне». За 13,5 *км* на ПнУ ад Брэста, 4 *км* ад чыг. ст. Матыкалы, каля аўтамаб. дарогі г. п. Жабінка — в. Вял. Матыкалы (1 *км*). 407 ж., гасп. 164 (1971). Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Абеліск 94 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

КАЗЛОВІЧЫ, вёска ў Глускім р-не Магілёўскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 21 *км* на У ад Глуска, 146 *км* ад Магілёва, 12 *км* ад чыг. ст. Брожа. 150 ж., двароў 58 (1971). Аддз. сувязі, магазін.

КАЗЛОВІЧЫ, вёска ў Калінкавіцкім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «1 Мая». За 32 *км* на Пн ад Калінкавіч, 154 *км* ад Гомеля, 8 *км* ад чыг. ст. Халоднікі, на аўтамаб. дарозе Калінкавічы — г. п. Азарычы. 632 ж., двароў 214 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Помнік на брацкай магіле 124 сав. воінаў Айч. вайны.

КАЗЛОВІЧЫ, вёска ў Слуцкім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Кірава. За 8 *км* на У ад Слуцка, 113 *км* ад Мінска, 4 *км* ад чыг. ст. Некрашы, на аўтамаб. дарозе Слуцк — в. Пагост. 1170 ж., двароў 326 (1971). Калгасны сокавы з-д, лесапільня, млын, швейная майстэрня. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, дзіцячы сад, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Вядомы народны хор. 2 помнікі: на брацкай магіле 36 сав. воінаў і землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

КАЗЛОЎ Аляксандр Герасімавіч (6.2.1918, в. Любаўка Аткарскага пав. Саратаўскай губ.— 22.11.1943), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). Канд. у чл. КПСС. На фронце з 1942, наводчык гарматы. Вызначыўся 2—4.10.1943 пры вызваленні в. Калыбань, Зладзеева, Пасудава Камарынскага р-на Палескай вобл. Знішчыў каля 2 узводаў варожай пяхоты. Загінуў у баі за гарадскі пасёлак Васілевічы. Яго імем названа вуліца ў Васілевічах Гомельскай вобласці.

КАЗЛОЎ Аляксей Васілевіч [н. 12(25).2.1913, мяст. Лоеў Мінскай губ.], Герой Сав. Саюза (1944). З сялян. Чл. КПСС з 1942. Скончыў школу лётчыкаў (1934). Удзельнік сав.-фінляндскай вайны 1939—40, зрабіў 57 вылетаў. У Айч. вайну на фронце — з 1941 штурман далёкаразведвальнай авіяэскадрыллі. Зрабіў 247 баявых вылетаў, збіў 14 варожых самалётаў. 3.3.1944 яго самалёт быў збіты. Пасля ампутацыі ног К. астаўся інструктарам авіяц. вучылішча. З 1947 на радзіме, працуе заг. арганізаванай ім дзіцячай б-кі.





КАЗЛОЎ Арсен Яфімавіч [10(23).2.1919, в. Газьба Гарадоцкага пав. Віцебскай губ.— 12.8.1971], Герой Сав. Саюза (1945). З сялян. Чл. КПСС з 1944. У Чырв. Арміі з 1939. У Айч. вайну на фронце з 1941. Вызначыўся пры фарсіраванні Дуная каля г. Харта (Венгрыя). У ноч на 1.12.1944 камандзір разліку дэсантнай лодкі К. першы высадзіўся на заняты ворагам бераг, уварваўся ў варожыя траншэі, чым садзейнічаў паспяховай высадцы дэсанта. Жыве ў в. Мяжа Гарадоцкага р-на Віцебскай вобл.

КАЗЛОЎ Васіль Іванавіч [5(18).2.1903, в. Заграддзе Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ.— 2.12.1967], парт. і дзярж. дзеяч БССР, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1942). Ген.-м. (1943). З сялян. Чл. КПСС з 1927. Скончыў Камуніст. ун-т імя Леніна ў Мінску (1933). Працоўную дзейнасць пачаў у 1917 рабочым на чыгунцы, потым слесар дэпо на ст. Жлобін. У 1925—27 у Чырв. Арміі. У 1928—40 на сав. і парт. рабоце ў Жлобінскім, Старобінскім, Чэрвеньскім р-нах. У 1940 нам. старшыні СНК БССР. З сак. 1941 сакратар Мінскага абкома КП(б)Б. У Айч. вайну пакінуты ў тыле ворага для арганізацыі камуніст. падполля і партыз. руху. З ліп. 1941 першы сакратар *Мінскага падпольнага абкома КП(б)Б* і камандзір *Мінскага партызанскага злучэння.* Праявіў выдатныя здольнасці арганізатара і асабістую мужнасць. У 1944—48 першы сакратар Мінскага абкома і гаркома КП(б)Б. З 1947 старшыня Вярх. Савета БССР. У 1948—67 старшыня Прэзідыума Вярх. Савета БССР і нам. Старшыні Прэзідыума Вярх. Савета СССР. На XX і XXII з'ездах КПСС выбіраўся канд., на XXIII — чл. ЦК. На XIX—XXII, XXIV—XXVI з'ездах КПБ выбіраўся чл. ЦК, чл. Бюро ЦК КПБ (1945—67). Дэп. Вярх. Савета СССР 2—7-га скл., Вярх. Савета БССР 2—7-га скл. Аўтар мемуарных твораў. Узнаг. 5 ордэнамі Леніна, 4 інш. ордэнамі, медалямі СССР; 4 узнагародамі замежных краін. Імем К. названы вул. і з-д у Мінску, вул. ў Салігорску, Жлобіне, саўгас і школа ў Жлобінскім р-не, піянерскія дружыны; на доме, дзе жыў, мемарыяльная дошка.

Тв.: Вместе с массами, под контролем масс, М., 1962; Людзі асобага складу, Мн., 1967; Верен до конца, М., 1970.

Літ.: Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны, т. 1, Мн., 1967; Линило П. П. КПБ — организатор и руководитель партизанского движения в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны, Мн., 1959; Калинин П. З. Партизанская республика, 2 изд., Мн., 1968; Ливенцев В. Партизанский край, Мн., 1969; Мачульский Р. Вечный огонь, 2 изд., Мн., 1969; Яковенко В. К. На оккупированной земле, Мн., 1969; Люди легенд, в. 1, М., 1965.

КАЗЛОЎ Георгій Кірылавіч [19.12.1902 (1.1.1903), в. Селяхі Брэсцкага пав. Гродзенскай губ.— 21.12.1970], генерал-лейтэнант (1944). З сялян. Чл. КПСС з 1920. Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1933). У Чырв. Арміі са снеж. 1918. Удзельнік грамадз. вайны на Зах. фронце, разгрому Краснаўцкага мяцяжу. У 1933—39 у БВА. У Айч. вайну на Карэльскім, 2-м Бел. і 1-м Укр. франтах — камандзір дывізіі, корпуса, камандуючы арміі. Удзельнік вызвалення Сав. Запаляр'я, Чэхаславакіі, вайны з імперыял. Японіяй. У 1946—65 нач. штаба ваен. акругі, нач. кафедры, факультэта і нам. нач. Ваен. акадэміі. З 1965 у запасе. Узнаг. ордэнам Леніна, 6 інш. ордэнамі, медалямі.



КАЗЛОЎ Іван Харытонавіч (1912 — снеж. 1942), удзельнік *Мінскага камуністычнага падполля* ў Айч. вайну. Чл. КПСС. Напярэдадні Айч. вайны артыст Бел. дзярж. філармоніі. З першых дзён акупацыі Мінска ўключыўся ў барацьбу супраць ням.-фаш. захопнікаў. Па-майстэрску афармляў дакументы для падпольшчыкаў, распаўсюджваў л-ру, выводзіў з фаш. лагераў ваеннапалонных, рабіў ім дакументы і накіроўваў у партыз. атрады. 26.10.1942 гітлераўцы арыштавалі К. і закатавалі. Пісьмы К. з турмы, якія друкаваліся ў партыз. падпольным друку, садзейнічалі патрыятычнаму выхаванню сав. людзей. Узнаг. ордэнам Айч. Вайны 1-й ступені. У Мінску на доме, дзе жыў К., мемарыяльная дошка.

Літ.: О партийном подполье в Минске в годы Великой Отечественной войны, Мн., 1961; Новікаў І. Руіны страляюць ва ўпор, Мн., 1962.

В. С. Давыдава. Мінск.

КАЗЛОЎ Мікалай Сямёнавіч [н. 4(17).5.1907, Цвер], беларускі савецкі хімік-арганік. Акад. АН БССР (1966), д-р хім. н. (1935), праф. (1933). Засл. дз. нав. і тэхн. РСФСР (1965). Чл. КПСС з 1929. У 1933—38 дырэктар Ін-та хіміі АН БССР і заг. кафедры арган. хіміі БДУ, у 1946—67 узначальваў кафедры хіміі ў ВНУ г. Пярмі. З 1967 дырэктар Ін-та фі-



зіка-арган. хіміі АН БССР. Навук. працы па арган. каталізе. Вывучаў каталіт. кандэнсацыю ацэтылену, сінтэзаваў хларапрэнавы каўчук (з М. Дз. *Зялінскім*). Прапанаваў новыя спосабы сінтэзу гетэрацыкл. злучэнняў (рэакцыя К.). Даследаванні ў галіне плацінавых каталізатараў укаранёны ў хім. прамысловасць. Узнаг. 2 ордэнамі.

Тв.: (Разам з П. Федасеевым) Каталитический синтез хинальдина, Мн., 1935; 5, 6-Бензохинолины, Мн., 1970; Каталитический синтез кислород- и азотсодержащих гетероциклов на гетерогенных катализаторах, у кн.: Гетерогенный катализ в реакциях получения и превращения гетероциклических соединений, Рига, 1971.

Літ.: Скриган А. И., Н. С. Козлов, «Весці АН БССР. Сер. хімічных навук», 1967, № 2.

КАЗЛОЎ Мікалай Яўгенавіч [н. 25.11(8.12). 1908, в. Кіцін Бабруйскага пав. Мінскай губ.], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Палескай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1939. Скончыў Рэсп. парт. школу пры ЦК КП(б)Б (1949). У 1930—33 у Чырв. Арміі, з 1933 на гасп. і сав. рабоце ў Даманавіцкім р-не. У партызанах з снеж. 1941 — камісар атрада, з чэрв. 1943 камісар *партызанскай брыгады 101-й Даманавіцкай* Палескай вобл. З снеж. 1943 старшыня Даманавіцкага райвыканкома, дырэктар саўгаса, крухмальнага з-да ў Брагінскім р-не. Узнаг. ордэнам Леніна, 4 інш. ордэнамі, медалямі. Жыве ў Брагінскім р-не.

КАЗЛОЎ Міхаіл Фёдаравіч (н. 1922, с. Быркі Нерчынска-Заводскай акр. Забайкальскай вобл.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Вызначыўся пры прарыве варожай абароны на Віцебшчыне. 24.6.1944 у складзе групы адзін з першых фарсіраваў Зах. Дзвіну, удзельнічаў у баях за плацдарм і адбіваў контратакі ворага.

КАЗЛОЎ Пётр Кузьміч [3(15).10.1863, г. Духаўшчына Смаленскай губ.— 26.9.1935], савецкі географ, даследчык Цэнтр. Азіі. Акад. АН УССР (1928). З 1883 да 1895 удзельнік экспедыцый М. М. Пржавальскага, М. В. Пяўцова, У. І. Рабароўскага. Узначальваў экспедыцыі: мангола-тыбецкую (1899—1901), манголасычуанскую (1907—09), мангола-тыбецкую (1923—26), у час якіх сабраны каштоўныя матэрыялы пра араграфію, геалогію, клімат, расліны і жывёльны свет, насельніцтва, гісторыю Цэнтр. Азіі. Рускае геагр. т-ва прысудзіла К. Канстанцінаўскі медаль (1902), Італьян. геагр. т-ва — Вялікі Залаты медаль (1911), Парыжская АН — прэмію імя П. А. Чыхачова (1913). Імя К. носіць ледавік у Манг. Алтаі.



Тв.: Монголия и Амдо и мертвый город Хара-Хото, 2 изд., М., 1947; Монголия и Кам, 2 изд., М., 1948.

Літ.: Дмитриев В. В. Русский географ и путешественник П. К. Козлов, Смоленск, 1951.

КАЗЛОЎ Пётр Міхайлавіч [12(24).7.1893, в. Калена Дзісенскага пав. Віленскай губ.— 17.4.1944], генерал-лейтэнант (1944), Герой Сав. Саюза (1943). З сялян. Чл. КПСС з 1917. Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1926). У Чырв. гвардыі з 1917, потым у Чырв. Арміі. Удзельнік грамадз. вайны. Узнаг. ордэнам Чырв. Сцяга (1923). У Айч. вайну на Паўд., Паўд.-Зах., Паўн.-Каўказскім і Цэнтр. франтах — нам. камандуючага, камандуючы армій, камандзір корпуса. Вызначыўся ў баях за Дняпро ў Чарнігаўскай вобл. У вер. 1943 корпус, якім камандаваў К., з ходу фарсіраваў раку, захапіў плацдарм, чым забяспечыў пераправу часцей арміі.



КАЗЛОЎ Фрол Раманавіч [5(18).8.1908, в. Лошчына Касімаўскага пав. Разанскай губ.— 30.1.1965], савецкі парт. і дзярж. дзеяч. Герой Сац. Працы (1961). З сялян. Чл. КПСС з 1926. Скончыў Ленінградскі політэхн. ін-т імя Калініна (1936). З 1936 на Іжэўскім металург. з-дзе. У 1940—44 сакратар Іжэўскага гаркома партыі; у 1944—47 у апараце ЦК ВКП(б). У 1947—49 сакратар Куйбышаўскага абкома партыі. У 1949—52 парторг ЦК на Кіраўскім з-дзе ў Ленінградзе, сакратар, першы сакратар Ленінградскага гаркома КПСС. У 1952—57 сакратар, першы сакратар Ленінградскага абкома КПСС. З 1957 старшыня Савета Міністраў РСФСР. У 1958—60 першы нам. Старшыні Савета Міністраў СССР. У 1960—64 сакратар ЦК КПСС. На XIX, XX, XXII з'ездах КПСС выбіраўся чл. ЦК. У лютым — чэрв. 1957 канд. у чл., у 1957—64 чл. Прэзідыума ЦК КПСС. Чл. Бюро ЦК КПСС па РСФСР. Дэп. Вярх. Савета СССР 3—6-га скл. Чл. Прэзідыума Вярх. Савета СССР у 1954—58, 1962—64. Узнаг. 4 ордэнамі Леніна, 4 інш. ордэнамі, медалямі. Пахаваны на Краснай плошчы ў Маскве.

КАЗЛОЎ Яўген Аляксандравіч (16.10.1921, в. Усаўка Сяргацкага пав. Ніжагародскай губ.— 7.10.1942), адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Віцебскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1941. З 1940 у Чырв. Арміі. На фронце палітрук роты. У партызанах з студз. 1942; з мая 1942 камісар *партызанскай брыгады 3-й Беларускай* Віцебскай вобл. Узнаг. ордэнам Айч. Вайны 1-й ступені. Загінуў пры катастрофе самалёта.

КАЗЛОЎКА, вёска ў Светлагорскім р-не Гомельскай вобл., каля р. Бярэзіна (2 *км*). Цэнтр сельсавета і саўгаса «Парычы». За 33 *км* на ПнЗ ад Светлагорска, 143 *км* ад Гомеля, 30 *км* ад чыг. ст. Светлагорск-на-Бярэзіне, 2 *км* ад прыстані Парычы (на Бярэзіне), на скрыжаванні шашы Мазыр — Бабруйск і аўтамаб. дарогі Акцябрскі — Парычы. 706 ж., двароў 246 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, дзіцячы сад, аддз. сувязі, сталовая, магазін. У 1944 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі.

КАЗЛОЎСКІ Аляксандр Мікалаевіч [1832, Мсціслаўскі пав. Магілёўскай губ.— 1890(?)], беларускі вучоны ў галіне меліярацыі с.-г. зямель. Праф. (1860). У 1852 скончыў Горы-Горацкі земляробчы ін-т, дзе працаваў інжынерам (1856—60), быў прафесарам кафедры механікі і архітэктуры. За ўдзел у паўстанні 1863 на 6 гадоў высланы ў Таўрыйскую губ. Асн. працы па пытаннях апрацоўкі глебы, асушэння зямель. Зрабіў першы ў Расіі ганчарны дрэнаж.

КАЗЛОЎСКІ Антон Ігнатавіч [н. 15(27).8. 1899, в. Шутнае Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ.], беларускі савецкі вучоны ў галіне селекцыі с.-г. раслін. Д-р с.-г. н. (1955), праф. (1956). Скончыў Маск. с.-г. акадэмію імя Цімірязева (1924). У 1924—27 у Наркамземе БССР. У 1933—40 ва Усесаюзным ін-це кармоў. Заг. аддзела кормавытворчасці Сібірскага НДІ жывёлагадоўлі (1940—1957). Праф. Бел. с.-г. акадэміі (1957—58). З 1958 заг. аддзела цукр. буракоў Бел. НДІ земляробства. Асн. працы па пытаннях вытворчасці кармоў, па агратэхніцы вырошчвання, селекцыі і насенняводстве кармавых караняплодаў і цукр. буракоў. Вывеў 4 сарты кармавых караняплодаў. Узнаг. ордэнам «Знак Пашаны», медалямі.

Тв.: Травопольные кормовые севообороты, Новосибирск, 1951; Кормовые корнеплоды в Западной Сибири, М., 1956; (разам з Р. І. Жамойдзікам) Кормовые корнеплоды, Мн., 1967.

КАЗЛОЎСКІ Васіль Максімавіч [8(21).4. 1916, Віцебск — 1945], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Віцебскай вобл. ў Айч. вайну. З рабочых. Чл. КПСС з 1943. У 1933—37 механік ф-кі «КІМ» у Віцебску. З 1937 у Чырв. Арміі, з 1939 шафёр у Віцебску, Энгельсе. У партызанах з крас. 1942 — палітрук роты, камісар атрада; з кастр. 1943 камісар *партызанскай брыгады 1-й Віцебскай*. З 1944 у Вілейскім аблвыканкоме. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.

КАЗЛОЎСКІ Віктар Іванавіч [н. 24.8(6.9). 1905, в. Мрочкі Ігуменскага пав. Мінскай губ.], беларускі савецкі паэт. З сялян. Скончыў літ.-лінгвіст. аддз. БДУ (1931). Друкавацца пачаў у 1925 у газ. «Беларуская вёска» і «Савецкая Беларусь». Быў чл. літ. аб'яднанняў «Маладняк», БелАПП. У 1932 выдаў зб. вершаў «Слова аб юнай краіне», «Музыка працы» і ліра-паэму «Рахіль». Паэзіі К. характэрныя ўскладненая метафарычнасць, пошукі новых формаў страфічнай будовы верша. Жыве на радзіме. *С. П. Шушкевіч.* Мінск.

КАЗЛОЎСКІ Восіп (Юзаф) Антонавіч [1757, Варшава — 27.2(11.3).1831], рускі кампазітар і муз. дзеяч. Паводле адных звестак, па паходжанні паляк, паводле іншых — беларус. У 1775—86 выкладчык музыкі ў кн. Агінскіх у Троках, пазней у Слоніме (вучыў Міхала Клеафаса Агінскага, браў удзел у рабоце Слонімскай капэлы). З 1786 жыў у Расіі, у 1799—1819 кіраваў муз. часткай імператарскіх т-раў у Пецярбургу. Аўтар музыкі да драм. спектакляў, у т. л. адзначанай рамант. рысамі музыкі да трагедыі У. Озерава «Фінгал» (1805), паланезаў. Асабліва значная праца К. ў галіне вак. лірыкі, дзе ён выступіў як адзін са стваральнікаў характэрнага муз. эстэтыцы рамантызму жанру раманса.

Літ.: Левашова О. Е. Песни Козловского, у кн.: Русско-польские музыкальные связи, М., 1963.

КАЗЛОЎСКІ Іван Сямёнавіч [н. 11(24).3.1900, в. Мар'янаўка Васількоўскага пав. Кіеўскай губ.], украінскі і рускі савецкі спявак (лірычны тэнар). Нар. арт. СССР (1940). Скончыў Кіеўскі муз.-драм. ін-т (1920). Спяваў у оперных т-рах Палтавы, Харкава, Свярдлоўска. У 1926—54 саліст Вял. т-ра СССР. З партый: Ленскі («Яўген Анегін» П. Чайкоўскага), Юродзівы («Барыс Гадуноў» М. Мусаргскага), Лаэнгрын («Лаэнгрын» Р. Вагнера), Альфрэд («Травіята» Дж. Вердзі), Фаўст («Фаўст» Ш. Гуно). У 1938—41 кіраваў створаным ім канцэртным Ансамблем оперы. Шырока вядомы і як камерны спявак. Дзярж. прэміі СССР 1941, 1949. Узнаг. 3 ордэнамі Леніна, ордэнам «Знак Пашаны», медалямі.

Літ.: Кузнецова А. Народный артист. Страницы жизни и творчества И. С. Козловского, М., 1964.

КАЗЛОЎСКІ Ігнат Ігнатавіч [2(15).2.1917, в. Вялікія Прусы Слуцкага пав. Мінскай губ.— 8.6.1962], Герой Савецкага Саюза (1945). З сялян. Чл. КПСС з 1940. Скончыў ваеннае авіяцыйнае вучылішча (1939). У Чырв. Арміі з 1936. У Айч. вайну на Зах., 1-м і 4-м Укр. франтах. Зрабіў 120 баявых вылетаў, у т. л. ў тыл ворага, каб даставіць боепрыпасы акружаным каля Вязьмы сав. воінам і вывезці раненых. Знішчыў 80 аўтамашын, 15 танкаў, 30 чыг. вагонаў, 20 кропак зенітнай артылерыі.



КАЗЛОЎСКІ Іосіф Вікенцьевіч (н. 12.3.1928, в. Кунцаўшчына Ашмянскага пав. Віленскага ваяводства), беларускі савецкі вучоны ў галіне тэрапіі і курарталогіі. Д-р мед. н. (1971). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1951). Працаваў на Піншчыне (1951—61) і ў санаторыі «Беларусь» на курорце Друскінінкай (1961—67). З 1968 — дац. кафедры шпіт. тэрапіі Гродзенскага мед. ін-та. Асн. працы па лячэнні хвароб жоўцевых шляхоў, печані, страўніка.

Тв.: Лечение больных хроническими холециститами на курорте Друскининкай, «Советская медицина», 1966, № 1; Течение хронического холецистита и гастрита под влиянием лечения на курорте Друскининкай, «Здравоохранение Белоруссии», 1969, № 1; Функция печени у больных с хроническими воспалительными заболеваниями желчных путей и печени, «Клиническая медицина», 1971, № 2.

КАЗЛОЎСКІ Мечыслаў Юльевіч (13.1.1876, Вільня — 3.3.1927), прафесійны рэвалюцыянер, савецкі дзярж. дзеяч. З сям'і настаўніка. Чл. КПСС з 1900. Удзельнік польскага і рус. рэвалюц. руху з 1893, рэвалюцыі 1905—07. Адзін з арганізатараў партыі «Сацыял-дэмакратыя Каралеўства Польскага і Літвы». Неаднойчы арыштоўваўся. Пасля Лют. рэвалюцыі чл. Петраградскага к-та РСДРП(б) і Выканкома

Савета, чл. ЦВК 1-га скл. У ліп. 1917 з У. І. Леніным абвінавачаны Час. урадам у дзярж. здрадзе; арыштаваны. Пасля Кастр. рэвалюцыі чл. калегіі Наркамата юстыцыі і старшыня Малога СНК РСФСР. З лют. 1919 нарком юстыцыі і чл. ЦВК Літ.-Бел. ССР. У 1922—23 на дыпламат. рабоце, з 1923 у Наркамаце шляхоў зносін СССР.

КАЗЛОЎСКІ Мікалай Кузьміч [2(15).12.1917, в. Гапонавічы Сенненскага пав. Магілёўскай губерніі — 11.10.1943], Герой Савецкага Саюза (1944). З сялян. У Чырвонай Арміі з 1939. У Айчынную вайну на Паўд.-Зах., Варонежскім франтах. Вызначыўся ў вер. 1943 у Кіеўскай вобл. Танк. рота пад каманд. К. 26.9.1943 фарсіравала Дняпро каля в. Зарубінцы, 28—29.9. 1943 каля в. Вялікі Букрын адбіла 6 контратак праціўніка, падбіла 6 танкаў і самаходных гармат, знішчыла 2 мінамётныя батарэі, 50 станковых кулямётаў. Загінуў у баі.



КАЗЛОЎСКІ Міхаіл Іванавіч [26.10(6.11). 1753, Пецярбург — 18(30).9.1802], рускі скульптар. Найб. значны прадстаўнік класіцызму. Вучыўся ў Пецярбургскай АМ (1764—73; з 1794 акад. і праф. акадэміі). Ідэі патрыятызму, грамадз. дабрадзейнасці, маральнай велічы чалавека К. ўвасобіў у міфалаг. і гістар. вобразах антычнасці («Няспанне Аляксандра Македонскага», 80-я г.; «Палікрат», 1790; «Аякс бароніць цела Патрокла», 1796; «Геркулес на кані», 1799), у вобразах рус. нац. гісторыі («Якаў Далгарукі», 1797, і інш.). Найб. значныя творы: «Самсон» (1800—02; скульпт. група для фантана ў Пецяргофе) і помнік А. В. Суораву (1799—1801) у Пецярбурзе.



Аўтапартрэт.

Літ.: Петров В. Н., М. И. Козловский, у кн.: История русского искусства, т. 6, М., 1961.

КАЗЛОЎСКІ Уладзімір Аляксандравіч (1923, в. Васькава Віцебскага пав.— 29.10.1942), кіраўнік камсамольска-маладзёжнай дыверсійнай групы ў *Віцебскім камуністычным падполлі* ў Айч. вайну. З сялян. Удзельнік абароны Віцебска ў ліп. 1941. Пакінуты ў Віцебску на падпольнай рабоце. На гарадской электрастанцыі стварыў падпольную групу, члены якой вялі разведвальна-дыверсійную і агіт.-прапагандысцкую работу, узарвалі 2 трансфарматарныя будкі, арганізавалі дыверсіі на электрастанцыі. Загінуў К. разам з бацькам пры падачы святловых сігналаў сав. самалётам.

Н. І. Дарафеенка. Віцебск.



Вуліца Леніна ў г. п. Казлоўшчына.

КАЗЛОЎШЧЫНА, гар. пасёлак (з 1958) у Дзятлаўскім р-не Гродзенскай вобл. Размешчаны на шашы Слонім — Дзятлава, за 20 *км* на Пд ад Дзятлава, 154 *км* ад Гродна, 30 *км* ад чыг. ст. Слонім. 1,9 тыс. ж. (1971). Мэблевы цэх, млын, вінзавод, пякарня, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, яслі-сад, сельскае прафесійна-тэхн. вуч. механізацыі с. гасп., Дом піянераў, Дом культуры, 2 б-кі, бальніца. 24 і 25.11.1941 ням.-фаш. захопнікі недалёка ад К. расстралялі каля 300 мірных сав. грамадзян. Помнік У. І. Леніну. Абеліск савецкім воінам і партызанам, помнік землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

КАЗЛОЎШЧЫНА, вёска ў Пастаўскім р-не Віцебскай вобл., на р. Ласіца. Цэнтр сельсавета і калгаса «1 Мая». За 43 *км* на ПнУ ад Паставаў, 236 *км* ад Віцебска, 5 *км* ад чыг. ст. Навадруцк, на аўтамаб. дарозе, якая злучае вёску з Глыбокім і г. п. Шаркоўшчына і Варапаева. 292 ж., гасп. 91 (1971). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі, швейная майстэрня, 2 магазіны. Помнік 22 сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну.

КАЗЛЫ (Сарга), род млекакормячых сям. пустарогіх атр. парнакапытных. 8 відаў. Пашыраны ў Азіі, Паўднёвай Еўропе, на паўночным захадзе Афрыкі. У СССР 5 відаў: безааравы К. (C. aegagrus), вінтарогі К. (C. falconeri), сібірскі, ці цэнтральнаазіяцкі К. (C. sibirica), каўказскі і дагестанскі туры (C. caucasica, C. cylindricornis).



Вінтарогі казёл.

Даўж. жывёл 120—170 *см*, выш. ў карку 80—115 *см*. У самцоў вялікія рогі рознай формы (у самак маленькія) і доўгая барада. К.— тыповыя прадстаўнікі горнага ландшафту. Траваедныя, стадныя, палігамы. Нараджаюць звычайна 2 казлянят. Аб'ект промыслу. Вінтарогі і безааравы К.— продкі свойскай казы.

Літ.: Гептнер В. Г., Насимович А. А. и Банников А. Г. Млекопитающие Советского Союза, т 1, М., 1961.

В. М. Міхалап. Мінск.

КАЗЛЫ, вёска ў Нясвіжскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Дружба». За 14 *км* на ПдЗ ад Нясвіжа, 126 *км* ад Мінска, 25 *км* ад чыг. ст. Пагарэльцы, каля аўтамаб. дарогі Нясвіж — Баранавічы (3 *км*). 536 ж., двароў 157 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. У 1943 вёску часткова спалілі нямецка-фашысцкія захопнікі.

КАЗНА, 1) пры феадалізме сукупнасць рэсурсаў дзяржавы, а таксама маёмасць караля, князя, герцага, манастыра і інш. 2) Дзяржава як суб'ект маёмасных правоў і інтарэсаў.

КАЗНАЧЭЙСКІЯ БІЛЕТЫ, від неразменных на золата *папяровых грошай*. З'явіліся ў канцы 18 ст., знаходзяцца ў грашовым абарачэнні разам з *банкаўскімі білетамі*.

У капіталіст. краінах К. б. выпускаюцца, каб пакрыць бюджэтны дэфіцыт і надзвычайныя, пераважна ваенныя, расходы, што непазбежна вядзе да інфляцыі. Пасля ліквідацыі залатога стандарту розніца паміж банкаўскімі білетамі і К. б. усё больш сціраецца. У СССР выпускаюцца Дзяржбанкам СССР вартасцю 1; 3; 5 руб. для размену банкаўскіх білетаў і абслугоўвання дробных плацяжоў. Колькасць К. б. у абарачэнні рэгулюецца эмісійным планам Дзяржбанка СССР. Забяспечваюцца ўсім грамадскім набыткам, устойлівыя дзякуючы планаваму рэгуляванню таварных цэн і даходаў насельніцтва. Такая ж прырода К. б. і ў інш. сацыяліст. дзяржавах.

КАЗНАЧЭЙСТВА, у капіталіст. дзяржавах фін. орган па касавым выкананні дзярж. і мясцовага бюджэтаў.

Забяспечвае прыбытковую частку бюджэту праз збор падаткаў з насельніцтва, пошлін і даходаў; ажыццяўляе хаванне і выдаткаванне сродкаў у адпаведнасці з зацверджанымі асігнаваннямі; рэгулюе дзярж. доўг, прадае гербавую паперу, бандэролі, размяшчае дзярж. пазыкі і інш. У некат. краінах праводзіць эмісію *казначэйскіх білетаў*. У дарэвалюц. Расіі ўваходзіла ў склад мін-ва фінансаў як дэпартамент дзярж. К. На Беларусі, як і ў інш. губ. Расіі, функцыянавалі губернскія і павятовыя К. У СССР касавае выкананне бюджэту ажыццяўляе *Дзяржбанк СССР*. Гл. таксама *Банкі*.

КАЗУАРЫ (Casuarii, Casuariiformes), атрад птушак-бегуноў. 2 сямействы: уласна К. (5 відаў) і *эму*. Пашыраны ў Аўстраліі і на блізкіх да яе астравах.



Звычайны казуар.

Маса уласна К. больш за 50 *кг*, сярэдняя выш. 1,8 *м*. Ногі трохпальцыя, дужыя. Косці пнеўматычныя. Крылы рудыментарныя, хваста няма. Пер'е рассуканае, чорнае. Лясныя птушкі. Жывуць парамі, ядуць 3—5 лец. Наседжвае пераважна самец. Корміцца уласна К. пладамі трапічных раслін і часткова жывёльным кормам. Колькасць іх невялікая, ахоўваюцца законам.

Літ.: Руководство по зоологии, т. 6, М.— Л., 1940; Жизнь животных, т. 5, М., 1970.

КАЗУБОЎСКІ Фёдар Андрэевіч [24.7(5.8). 1895, в. Багушова Пінскага пав. Мінскай губ.— 2.9.1942), адзін з арганізатараў узбр. паўстання на Палессі супраць ням. акупантаў і пятлюраўцаў, украінскі савецкі археолаг. З сялян. Чл. КПСС з 1928. Скончыў Смаленскі настаўніцкі ін-т (1916). У 1918—19 камандзір 2-га Палескага камуніст. палка, змагаўся супраць пятлюраўцаў і ням. акупантаў у раёне г. Сарны, Пінск, Дубровіца. У 20-я г. дырэктар краязнаўчага музея ў Корасцені, у 1934—36 дырэктар Ін-та гісторыі матэрыяльнай культуры АН УССР. Аўтар працы па археалогіі Украіны: «Запіскі пра археалагічныя доследы каля г. Корасценя ў 1925 годзе» (1926) і інш.

КАЗУЛІНА, вёска ў Прудзінкаўскім с/с Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Кастрычнік». За 20 *км* на ПдУ ад Верхнядзвінска, 140 *км* ад Віцебска, 10 *км* ад чыг. раз'езда Беніслаўскага. 195 ж., гасп. 70 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, магазін.

КАЗУЛІЧЫ, вёска ў Кіраўскім р-не Магілёўскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 11 *км* на З ад Кіраўска, 98 *км* ад Магілёва, 22 *км* ад чыг. ст. Бярэзіна, на аўтамаб. дарозе г. п. Кіраўск — в. Любонічы. 967 ж., двароў 342 (1971). Лесапільня, млын. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, 2 магазіны. У 1942 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі. Помнік на брацкай магіле 318 (паводле ўдакладненых звестак) мірных жыхароў, якіх 22.6.1942 загубілі ням.-фаш. карнікі.

КАЗУЛЯ, дзікая каза (Capreolus capreolus), млекакормячая жывёла з сям. аленевых атр. парнакапытных. Пашырана ў Еўропе і Азіі, на Беларусі ва ўсіх абласцях.

Даўж. цела К. 100—155 *см*, выш. ў карку 75—100 *см*, маса 20—59 *кг*. Цела ягрубае, лёгкае, ногі высокія, галава невялікая, шыя тонкая. Поўсць летам рыжая, зімою шэра-бурая (маладыя К. плямістыя). Хвост кароткі (2—3 *см*), схаваны ў поўсці. Жыве ў светлых лісцевых і мяшаных лясах, якія чаргуюцца з палянамі і балотамі. Корм — расліны. Нараджае 1—2 дзіцяняты. Каштоўны промысл. від. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Алені*.

Літ.: Сержанин И. Н. Млекопитающие Белоруссии, 2 изд., Мн., 1961 (бібліягр.); Флинт В. Е., Чугунов Ю. Д. и Смирин В. М. Млекопитающие СССР, М., 1970.

Ю. І. Сяржанін. Мінск.

КАЗУС (лац. casus выпадак), 1) выпадак, здарэнне. 2) Складаная, заблытаная суд. справа. 3) Дзеянне, якое на першы погляд мае прыкметы злачынства, але выклікана выпадковым збегам абставін і не мае элементаў віны. Асоба, якая зрабіла гэтае дзеянне, не можа быць прыцягнута да крымін. адказнасці.

КАЗУС БЕЛІ (лац. casus belli, ад bellum вайна), фармальная падстава для абвяшчэння вайны. Звычайна не супадае з сапраўднымі прычынамі вайны. Напр., К. б. 1-й сусв. вайны — забойства аўстр. эрцгерцага Фердынанда ў Сараеве; сапр. прычына — барацьба імперыял. дзяржаў за перадзел свету.

КАЗУС ФЕДЭРЫС (лац. casus foederis, ад foedus дагавор), факт або падзея, якія выклікаюць неабходнасць выканаць абавязацельствы, прадугледжаныя ў саюзным дагаворы паміж дзяржавамі. Напр., калі яп. войскі напалі на МНР (1939), СССР палічыў гэта К. ф. і, верны саюзнаму дагавору з МНР, заключанаму 12.3.1936, памог ёй узброенымі сіламі.

КАЗЬМА ПРУТКОЎ, літаратурны псеўданім групы рускіх пісьменнікаў 50—60-х г. 19 ст.— А. К. Талстога і братоў Аляксея, Аляксандра і Уладзіміра Жамчужнікавых. Сатыр. творы К. П. (вершы, байкі, афарызмы, літ. пародыі, камедыі) высмейвалі царскіх чыноўнікаў,

абывацельскую тупасць, пошласць, кансерватызм думкі. Многія выслоўі К. П. сталі крылатымі.

Тв.: Полное собр. соч., 2 изд., М.—Л., 1965.

КАЗЬЯНКІ, вёска ў Экіманскім с/с Полацкага р-на Віцебскай вобл., на левым беразе Зах. Дзвіны. Цэнтр саўгаса «Прагрэс». Прылягае да паўд.-зах. ускраіны Полацка, за 5 *км* ад чыг. ст. Полацк. 257 ж., гасп. 80 (1971). Ням.-фаш. захопнікі спалілі частку вёскі.

КАЗЬЯНЫ, вёска ў Шумілінскім р-не Віцебскай вобл., на левым беразе р. Обаль. Цэнтр сельсавета. За 35 *км* на Пн ад Шуміліна, 61 *км* ад Віцебска, на аўтамаб. дарозе г. п. Обаль — шаша Віцебск—Невель (РСФСР). 170 ж., гасп. 66 (1971). Лясніцтва, камбінат быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, клуб, аптэка, вет. пункт, адцз. сувязі, магазін. Помнік на могілках 177 сав. воінаў і помнік на брацкай магіле 25 сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

КАЗЯЛЕЦ (Ranunculus), род шмат-, радзей аднагадовых травяністых раслін сям. казяльцовых. Вядома больш за 600 відаў, пашыраных ва ўсіх частках свету, акрамя Антарктыды. У СССР 183, на Беларусі 20 відаў.



Казялец едкі.

Сцябло выш. да 1,5 *м*. Лісце пальчатараздзельнае. Кветкі пераважна жоўтыя, адзіночныя ці ў суквецціях. Плод — шарападобны шматарэшак. На Беларусі найб. пашыраныя: К. едкі (R. acer, нар. назвы: гладышнік, курыная слепата, казялкі), К. паўзучы (R. repens), К. ядавіты (R. sceleratus), К. пякучы, прышчынец (R. flammula), К. залацісты (R. auricomus). Растуць на вільготных лугах і ў лясах. Многія віды К. атрутныя для буйн. раг. жывёлы і авечак; некат. вырошчваюцца як дэкаратыўныя. К. едкі і К. паўзучы — лекавыя расліны.

Літ.: Пляшенко С. И. и Бибиков Ф. П. Ядовитые и вредные растения, Мн., 1965; Лекарственные растения. Дикорастущие, 4 изд., Мн., 1968.

КАЗЯЛУЖКА, вёска ў Хойніцкім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Хойніцкі». За 1 *км* на ПнЗ ад Хойнікаў, 104 *км* ад Гомеля, 4 *км* ад чыг. ст. Хойнікі, каля аўтамаб. дарогі Хойнікі — Калінкавічы. 1018 ж., двароў 253 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, адцз. сувязі, магазін. У 1942 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі.

КАЗЯНКОЎ Васіль Георгіевіч (1923, в. Кувандык Троіцкага пав. Чэлябінскай губ.— 7.4.1945), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1943. На фронце з 1942, лётчык-штурмавік. Вызначыўся пры вызваленні Віцебскай вобл. 26.6.1944 двойчы штурмаваў эшалоны ворага на ст. Орша, на ўчастку Трацылава — Талачын разбіў эшалон. Зрабіў 131 баявы вылет. Загінуў у баі.

КАЗЯНЫ, вёска ў Браслаўскім р-не Віцебскай вобл., у сутоку рэк Дрысвяты і Дзісны. Цэнтр сельсавета і калгаса «Гвардыя». За 62 *км* на ПдЗ ад Браслава, 290 *км* ад Віцебска, 20 *км* ад чыг. ст. Паставы, на аўтамаб. дарозе Браслаў — Паставы. 727 ж., гасп. 286 (1971). Лесапільня, млын, швейная і шавецкая майстэрні. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, аптэка, вет. пункт, адцз. сувязі, сталовая, 4 магазіны. У гады бурж. Польшчы ў К. дзейнічала падпольная ячэйка КПЗБ. Вёску спалілі ням.-фаш. захопнікі, загубілі 211 мірных жыхароў. Помнік на брацкай магіле 70 партызан Вял. Айч. вайны.

КАЗЯРОГ (лац. Capricornus), адно з 12 сузор'яў *задыяка*. На тэр. БССР відаць у канцы лета і ў пачатку восені. Гл. *Зорнае неба*.

КАЗЯРОГІ, вёска ў Лоеўскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 8 *км* на ПдЗ ад Лоева, 86 *км* ад Гомеля, 53 *км* ад чыг. ст. Рэчыца. 490 ж., двароў 163 (1971). Пач. школа, клуб, фельч.-ак. пункт, швейная майстэрня, магазін. Помнік на брацкай магіле 247 сав. воінаў Айч. вайны.

КАЗЯТНІКАЎ Сяргей Піліпавіч (1904, в. Бярлеж Мінскага пав.— 30.7.1943), удзельнік партыз. руху ў Мінскай вобл. ў Айч. вайну. Мінёр дыверсійнай групы ў атрадзе імя Калініна партыз. брыгады 1-й Мінскай. Вызначыўся 30.7.1943. На чыг. Мінск — Бабруйск, якая ахоўвалася ўзмоцненымі варожымі патрулямі, паміж чыг. ст. Блужа і Талька пры набліжэнні цягніка ўзарваў міну, знішчыў 9 вагонаў з жывой сілай праціўніка і сам загінуў. Пахаваны на ст. Блужа Пухавіцкага р-на Мінскай вобл.

КАІН, гл. *Авель і Каін*.

КАІР, сталіца Арабскай Рэспублікі Егіпет (АРЕ) і адм. цэнтр аднайменнай мухафазы (губернатарства). Найб. горад у Афрыцы. Размешчаны на берагах і а-вах Ніла. Вузел чыг. і шашэйных дарог, рачны порт, 4 аэрапорты (у т. л. 2 міжнар.). Важны гандл.-фін., прамысл. і культурны цэнтр краіны. 5 млн. ж. (1970). З-ды: аўтамабільны, па вытв. веласіпедаў, халадзільнікаў, металарэзных станкоў, эл. кабелю, аўтамаб. пакрышак, для рамонту трактароў; чыг. майстэрні. Тэкст., швейная, гарбарна-абутковая, тытунёвая і мэблевая прамысловасць. У прыгарадах К. цукрова-рафінадны, нафтаперапр., хім., паліграф., авіязборачны, цэментавыя з-ды. У прыгарадзе Хелуан з дапамогаю СССР пабудаваны коксахім. камбінат; працуюць металург. і вагонабуд. з-ды. Вытв. дываноў, маст. промыслы. Асн. музеі: Егіпецкі, Копцкі, ісламскага мастацтва, сучаснага мастацтва, 3 ун-ты, Ін-т прыгожых мастацтваў, Нац. б-ка.



Каір. Агульны выгляд.

Засн. ў 969 на Пн ад стараж. сталіцы Егіпта г. Фустат (засн. ў 641; сучасны Стары К.). З 973 К.— сталіца Каірскага халіфата (гл. *Фатымідаў халіфат*). У 1517 К. захапілі туркі. Горад заняпаў. У 1882 акупаваны англічанамі. Цэнтр нац.-вызв. руху (паўстанні 1919, 1921, антыангл. дэманстрацыі і выступленні ў 30-я г., у 1946, 1951 — пач. 1952 і інш.). З 1953 сталіца Егіпецкай Рэсп., з 1958 — Аб'яднанай Араб. Рэсп., з 1971 — Арабскай Рэсп. Егіпет. На тэр. К. зберагліся помнікі архітэктуры 7—15 ст.: рэшткі гарадскіх сцен з варотамі; мячэці: Амра, Ібн Тулуна, аль-Азхар; арх. комплексы: султана Калауна, мячэці-медрэсе султана Хасана, маузалея Каіт-бея, караван-сарай, палацы. У старой частцы К.— вузкія вуліцы без зеляніны, у Новым горадзе вуліцы шырокія з шматпавярховымі дамамі. Гал. магістралі сыходзяцца да пл. Тахрыр. Набярэжная Ніла абліцавана гранітам, пабудаваны масты (Універсітэцкі мост — 488 *м* даўж.). Многа паркаў, стадыён. Сярод помнікаў — «Абуджаніе Егіпта» (1919—28, скульпт. М. Мухтар). Іл. гл. таксама на ўкл. да арт. *Аб'яднаная Арабская Рэспубліка*.

КАІРСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ САЛІДАРНАСЦІ НАРОДАЎ АЗІІ І АФРЫКІ, міжнар. канферэнцыя прадстаўнікоў грамадскасці 45 азіяцкіх і афрыканскіх краін (Афганістан, Бірма, ДРВ, Егіпет, Інданезія, Індыя, Ірак, Іран, Камерун, КНДР, КНР, МНР, СССР і інш.). Адбылася ў Каіры 26.12.1957—1.1.1958. Удзельнікі канферэнцыі прынялі Дэкларацыю пра поўную падтрымку прынцыпаў *Бандунгскай канферэнцыі 1955*, рэзалюцыю пра эканам. і тэхн. супрацоўніцтва, сац. развіццё і культурныя сувязі, а таксама рэзалюцыі, у якіх асуджаліся імперыялізм ва ўсіх яго формах і праявах, расавая дыскрымінацыя. Быў прыняты зварот да СССР, ЗША і Вялікабрытаніі пра забарону выпрабаванняў ядзернай зброі, рэзалюцыя аб разбраенні, ліквідацыі пагрозы атамнай вайны і інш. дакументы.

Каб аб'яднаць і каардынаваць барацьбу народаў Азіі і Афрыкі супраць імперыялізму і каланіялізму, паскорыць вызваленне заняволеных народаў і забяспечыць іх эканам., сац. і культ. развіццё, на канферэнцыі створана пасталянная Арганізацыя салідарнасці народаў Азіі і Афрыкі (АСНАА). На 1969 у ле ўваходзіла калі 80 арг-цый — членаў. Пасталянны сакратарыят з 1964 у Каіры (АРЕ). У СССР працуе Сав. к-т салідарнасці народаў Азіі і Афрыкі. Як член АСНАА камітэт памагае рыхтаваць нац. кадры для краін Азіі і Афрыкі. Адзін з ініцыятараў заснавання Ун-та дружбы народаў імя Патрыса Лумумбы ў Маскве.

А. Дз. Зубар. Мінск.

КАІРСКІ ХАЛІФАТ, феад. дзяржава (909—1171) на тэрыторыі Егіпта, Паўн. Афрыкі, Сірыі, Палесціны, Зах. Аравіі з цэнтрам у Каіры. Гл. *Фатымідаў халіфат*.

КАЙГАРАДАЎ Аляксей Іванавіч [14(26).11.1881, Ноўгарад — 27.9.1951], беларускі савецкі кліматолаг і геафізік. Акад. АН БССР (1947; чл.-кар. АН БССР 1936). Д-р геафізічных н. (1934). З 1919 працаваў у Горацкім с.-г. ін-це (Беларуская с.-г. акадэмія) заг. кафедры метэаралогіі і кліматалогіі. У 1930—38 дырэктар Бел. геафізічнай абсерваторыі. З 1938 у Гал. управленні гідраметслужбы СССР. У 1940—44 заг. кафедры метэаралогіі Маскоўскага гідрамет. ін-та. З 1945 заг. кафедры агульнай фіз. геаграфіі ў Маскоўскім абласным пед. ін-це. Працы па клімаце, мікраклімаце і с.-г. метэаралогіі Беларусі; распрацаваў рэкамендацыі тэрмінаў сяўбы і інш. с.-г. работ для Беларусі, зрабіў класіфікацыю клімату зямнога шара.



Тв.: Кліматычны атлас Беларусі, Мн., 1927; Клімат БССР, Заходняй Беларусі і сумежных краін, т. 1—2, Мн., 1933—34; Нарыс сельскагаспадарчых кліматычных умоў БССР, 2 выд., Мн., 1935; Естественная зональная классификация климатов земного шара, М., 1955.

Літ.: Максимов С. А. Алексей Иванович Кайгородов, «Метеорология и гидрология», 1951, № 10.

КАЙГАРАДАЎ Дзмітрый Нічыпаравіч [31.8 (12.9).1846, Полацк — 11.2.1924], рускі прыродазнавец. Скончыў Пецярбургскі земляробчы ін-т (1871). Праф. кафедры лясной тэхналогіі гэтага ін-та (з 1875). У 1885 арганізаваў рус. феналагічную сетку, матэрыялы якой з'явіліся асновай для біякліматычнага раянавання Еўрап. часткі СССР. Склаў серыю феналагічных картаў вясновага прылёту птушак. Навук. працы таксама па тэхн. уласцівасцях драўніны, сухой перагонцы дрэва, лясным таваразнаўстве. Аўтар кніг «Гутаркі пра рускі лес» (2 серыі, 1879—80), «З зялёнага царства» (1888), «З царства птушыных» (1896) і інш.

Літ.: Памяти Дмитрия Никифоровича Кайгородова, Л., 1925 (бібліягр.); Русские географы и путешественники, Л., 1971 (бібліягр.).

КАЙМАКОЎ Пётр Васілевіч [н. 5(17).1.1894, с. Коржаўка Корсунскага пав. Сімбірскай губ.], беларускі савецкі вучоны ў галіне ветэрынарыі. Д-р вет. н. (1956), праф. (1958). Удзельнік Айч. вайны. Скончыў Казанскі вет. ін-т (1926), дзе працаваў у 1937—41 і 1945—55. Заг. кафедры паталогіі і тэрапіі Віцебскага вет. ін-та (1955—61). Асн. працы па этыялогіі, патагенезе, тэрапіі і прафілактыцы хвароб с.-г. жывёл. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.

Тв.: О возрастных изменениях содержания кальция в сыворотке крови у здоровых лошадей, «Уч. зап. Витебского ветеринарного ин-та», 1956, т. 14, в. 1; К функциональной диагностике заболеваний печени у крупного рогатого скота, у кн.: Вопросы зоотехнии и ветеринарии, Мн., 1964.

КАЙМАНАВЫ АСТРАВЫ (Cayman Islands), калонія Вялікабрытаніі ў Карыбскім м. Уключае тры а-вы агульнай пл. 260 *км*². Паверхня нізінная. Складзены пераважна з вапнякоў. Клімат трапічны, вільготны. Расліннасць трапічная. Нас. 9,2 тыс. чал. (1968), мулаты і неграў. Асн. занятак: лоўля рыбы, чарапах, кайманаў, вырошчванне садавіны, агародніны. Здабыча солі з мора; турызм. Адм. ц. Джорджтаўн. К. а. адкрыты Х. Калумбам у 1503,

КАЙНАЗО́ЙСКАЯ ЭРА (ГРУ́ПА), кайназо́й (ад грэч. kainós новы+zoë жыццё), эра новага жыцця, навейшая эра геал. гісторыі Зямлі, наступная за *мезазойскай эрай*. Цягнецца да цяперашняга часу. Падзяляецца на палеагенавы, неагенавы і антрапагенавы перыяды (гл. адпаведныя арт.). Працягласць К. э. каля 67 млн. гадоў.

У К. э. на зямным шары адбыліся вял. змены ў рэльефе, клімаце, развіцці арган. жыцця, прырода набыла сучаснае аблічча. У палеагене значныя плошчы на мацерыках былі ўкрыты морам. Канец палеагену і неагену характарызаваліся інтэнсіўным гораўтварэннем (гл. *Альпійская складкавасць*). З утварэннем гор вызваліліся а-пад вады і фарміраваліся сучасныя кантыненты, што вяло да змены клімату. У сярэднім палеагене вобласць тропікаў даходзіла да тэр. Беларусі. Потым пачалася пахаладанне, якое ў антрапагенавы час прывяло да шырокага развіцця на паўн. кантынентах (пераважна ў Паўн. Амерыцы і ў Еўропе) магутных тоўшчаў мацерыковага лёду. Змена клімату адбілася на развіцці флоры і фаўны. Сярод раслін пераважалі пакрытанасенныя, якія з'явіліся ў мелавым перыядзе. Яны хутка эвалюцыянавалі, далі мноства формаў і груповак, якія ўтварылі сучасную геагр. ванальнасць у размеркаванні раслін. Пераўтварэнне клімату і раслінпасці стварыла ўмовы для хуткай эвалюцыі жывёльнага свету. К. э.— эра млекакормячых, птушак, касцістых рыб, малюскаў. Прымітыўныя млекакормячыя ранняга палеагену даюць пачатак усім асн. групам сучасных капытных, хобатных, драпежнікаў. Асабліва хутка эвалюцыянавалі прыматы. З'яўленне чалавекападобных малпаў у неагене і чалавека сучаснага тыпу 40—50 тыс. гадоў назад — найб. важнае ввяно развіцця ўсёй прыроды ў К. э. Адклады К. г.— самыя разнастайныя пароды марскога і кантынентальнага паходжання. З імі ввязаны радовішчы нафты і газу, бурага вугалю, асн. радовішчы буд. матэрыялаў і інш.

Літ.: Страхов Н. М. Основы исторической геологии, ч. 1—2, М.— Л., 1948; Леонов Г. П. Историческая геология, М., 1956; Левитес Я. М. Историческая геология с основами палеонтологии и геологии СССР, 2 изд., М., 1970; Криштофович А. Н. Палеоботаника, 4 изд., Л., 1957; Давиташвили Л. Ш. Краткий курс палеонтологии, М., 1958. *С. С. Манькін.* Мінск.

КА́ПРЫ (Uria), род вадаплаўных птушак атр. чысцікаў сям. чысцікавых. Пашыраны на астравах умераных і палярных мораў Паўн. паўшар'я. У СССР 2 віды: тонкадзюбая К. і таўстадзюбая К.

Даўж. цела К. каля 50 *см*, маса каля 1 *кг*. Апярэнне двухкаляровае: зверху чарнавата-бурае, знізу белае. Жывуць К. ў негнездавы час у адкрытых морах. Гняздуюцца на прыбярэжных скалах вял. калоніямі, утвараючы разам з іншымі «птушыныя кірмашы». Нясуць 1 яйцо, кладуць яго на голых карнізах скалаў. Наседжваюць каля 35 дзён. Кормяцца дробнай марской рыбаю і беспазваночнымі. Яйцы і мяса К. ядомыя. У СССР К. ахоўваюцца ў запаведніку «Сем астравоў».

Літ.: Птицы Советского Союза, т. 2, М., 1951.

КАПШО́ЎКА, вёска ў Цырынскім с/с Карэліцкага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса «Зара». За 18 *км* на Пд ад Карэліч, 218 *км* ад Гродна, 40 *км* ад чыг. ст. Навагельня, на аўтамаб. дарозе, якая злучае вёску з Карэлічамі. 725 ж., гасп. 207 (1971). Васьмігадовая школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, 2 магазіны. У К. ў 1924 была арганізавана ячэйка КПЗБ. Помнік 105 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

КАКА́ВА, шакаладнае дрэва (Theobroma cacao), вечназялёнае дрэва сям. стэркуліевых. Дзіка расце ў трапічных лясах Амерыкі. Культывуецца як харч. расліна ў многіх трапічных краінах Афрыкі (Гана і Нігерыя), Цэнтр. і Паўд. Амерыкі і інш. У СССР расце ў аранжарэях.



Какава: *1* — ствол з пладамі; *2* — галінка з лістом і кветкамі; *3* — кветка.

Дрэва выш. 5—8 *м*. Лісце вялікае, бліскучае. Кветкі дробныя, жоўтыя або чырвоныя, у пучках. Плод — ягада чырвонага, жоўтага або аранжавага колеру, мае 25—60 міндалепадобных зярнят. Цвіце і пладаносіць увесь год. Зерне мае алкалоід тэабрамін, тлушчы (да 50%); ідзе на выраб *какавы-алею*. З абястлушчанага зерня гатуюць шакалад і напітак—какаву.

Літ.: Жуковский П. М. Культурные растения и их сородичи, 2 изд., Л., 1964.

КАКА́ВА-АЛЕЙ, алей насення шакаладнага дрэва (*какавы*).

Жаўтаватае, духмянае, прыемнага паху рэчыва. Шчыльн. (пры 40 °С) 920,6 *кг/м*³. Т-ра зацвярдзення 21,5—27 °С. Лік амылення 192—196. Ednы лік 34—38. Выкарыстоўваецца ў харч. і лёгкай прамысл. (вытворчасць шакаладу, губной памады), медыцыне (лекавых свечак і інш.).

Літ.: Какао, шоколад, пралінэ (конфеты), пер. с нем., М., 1966.

КАКА́НД, горад абл. падпарадкавання ў Ферганскай вобл. Узб. ССР. Размешчаны на З Ферганскай далiны. Вядомы з 10 ст. Вузел аўтамаб. дарог і чыгунак. 136 тыс. ж. (1971). Найб. развіта хім., металаапр., лёгкая і харч. прамысловасць. Суперфасфатны (ядахімікаты, серная кіслата), мех., бавоўнаачышчальны з-ды; панчошна-прадзільны камбінат, абуткавая і швейная ф-кі, мяса- і млынкамбінаты. Алейныя і вінаробныя прадпрыемствы. Пед. ін-т, агульнатэхнічны ф-т Ташкенцкага політэхн. і філіял Ташкенцкага ірыгацыйнага ін-таў, 7 сярэдніх спец. навуч. устаноў. Драм. тэатр. Краязнаўчы музей.

КАКА́НДСКАЕ ХА́НСТВА, феад. дзяржава ў Ферганскай даліне ў 18—19 ст.

Вылучылася з Бухарскага эмірата ў 1-й пал. 18 ст. Сталіца Каканд. Насельніцтва: узбекі, таджыкі, кіпчакі, кіргізы; гал. занятак — земляробства, качавая жывёлагадоўля (кіпчакі, кіргізы). Большаю ч. зямлі валодалі феадалы. Вярхоўная ўлада належала хану. У 30—40-я г. 19 ст. Англія пачала ўмацоўваць палiт. пазіцыі ў Сярэдняй Азіі, што выклікала процідзеянні рус. ўрада. У 1865 рус. войскі занялі Ташкент і Хаджэнт, а 1875 К. х. ў васальнай залежнасці ад Расіі, у 1876 ліквідавана, на яго тэр. ўтворана Ферганская вобл.

КАКАРБАКСІЛА́ЗА (тыямінпірафасфат), *кафермент*; лякарства, якое рэгулюе працэсы тканкавага абмену. Выпускаюць у парашках (у ампулах і флаконах). Ужываюць пры цукр. дыябеце, таксікозах цяжарнасці, парушэннях сардэчнага рытму, склерозе, каранарнай недастатковасці.

КАКАФО́НІЯ (ад грэч. kakós благі+phōnḗ гук) у музыцы, выпадковае, не апраўданае логікай муз. развіцця нагрувашчванне гукаў.

КАКІНА́КІ Уладзімір Канстанцінавіч [н. 30.6(13.7).1904, Новарасійск], двойчы Герой Сав. Саюза (1938, 1958), генерал-маёр авіяцыі (1943), засл. лётчык-выпрабавальнік СССР (1959). З рабочых. Чл. КПСС з 1938. Скончыў ваен. школу лётчыкаў (1930). У Чырв. Арміі з 1925. З 1935 лётчык-выпрабавальнік. Удзельнік беспасадачных пералётаў Масква — ЗША (1939) і Масква — Іркуцк — Камчатка — бухта Тыксі — Масква (1958). З 1966 у запасе. Ганаровы прэзідэнт Міжнароднай авіяц. федэрацыі (ФАІ). Дэп. Вярх. Савета СССР 1—2-га скл. Ленінская прэмія (1960). Узнаг. 5 ордэнамі Леніна, 7 інш. ордэнамі, медалямі. Жыве ў Маскве.



КАКІСІНА (Какішына), возера ў бас. Тураўлянкі, левага прытока Зах. Дзвіны, у Лепельскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 0,75 *км*². Даўж. 1,8 *км*, найб. шыр. 0,6 *км*, сярэдняя 0,4 *км*, найб. глыб. каля 20 *м*. Катлавіна выцягнута з ПнЗ на ПдУ, схілы над ворывам. Вадазбор (4 *км*²) дробнаўзгорысты. Возера каля берагоў зарастае чаротам і трыснягом; сцёк у воз. Вогзіна. Водзяцца плотка, верхаводка, шчупак, акунь, язь, лешч, джгір.

КАКЛЕ́Н (Coquelin) Бенуа Канстан (23.1.1841, Булонь-сюр-Мер — 27.1.1909), французскі акцёр. Наследаваў традыцыі класіцысцкай акцёрскай школы. Як тэарэтык падсумаваў яе агульныя прынцыпы. Яркі рэаліст. акцёр, меў высокую сцэн. культуру і тэхніку. Выступаў у т-рах «Камеды Франсез» (1860—86) і «Порт-Сен-Мартэн» (з 1897). Гастраляваў па Еўропе (у Расіі — 1882, 1884, 1889, 1892, 1903) і Амерыцы. Выконваў камед. ролі ў класічным рэпертуары: Фігара («Вяселле Фігара» П. Бамаршэ), Сірано дэ Бержэрак (аднайм. п'еса Э. Растана), у п'есах Мальера, тагачасных драматургаў.

Літ. тв.: Рус. пер.— Искусство актера, Л.— М., 1937.

КАКО́САВАЯ ПА́ЛЬМА (Cocos nucifera), вечназялёнае двухдомнае дрэва сям. пальмавых. Расце ў тропіках (па ўзбярэжжах акіянаў), дзе шырока культывуецца.



Какосавая пальма: *1* — агульны выгляд дрэва; *2* — арэх; *3* — падоўжны разрэз арэха.

Дрэва выш. 30 *м*, крона з вял. перыстых ліcцяў. Кветкі аднаполыя, сабраныя ў пазушныя суквецці. Плод — касцянка (какосавы арэх), насенне і вадкасць яго («какосавае малако») ядомыя. З высушанай мякаці пладоў (копры) атрымліваюць алей. Драўніна К. п. выкарыст., ў буд-ве.

Літ.: Жуковский П. М. Культурные растения и их сородичи, 2 изд., Л., 1964.

КАКО́ЎЧЫНА, вёска ў Сенненскім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Какоўчына». За 57 *км* на ПдУ ад Сянна, 62 *км* ад Віцебска, 3 *км* ад чыг. ст. Смальяны, на аўтамаб. дарозе, якая злучае вёску з г. п. Багушэўск. 164 ж., 48 двароў (1971). Сярэдняя школа, б-ка, вет. пункт, аддз. сувязі, швейная майстэрня, магазін. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў і партызан Айч. вайны.

КАКО́ШНІК, старажытны рускі нацыянальны галаўны ўбор замужніх жанчын. У дапятроўскай Русі бытаваў у баярскім асяроддзі, у 19 ст. ў сялянскім і купецкім. Насілі сялянкі пераважна паўн. абласцей як вясельны і святочны галаўны ўбор. Рабілі на цвёрдай аснове, упрыгожвалі парчою, пазументам, бісерам, пацеркамі, жэмчугам.

КАКО́ШНІК (у архітэктуры), паўкруглая ці кілепадобная фальшывая *закамара*. К. не закрывае пралётаў зводу і мае толькі дэкар. значэнне. Часта К. размяшчаюцца ярусамі. Тыповыя для рус. дойлідства 16—17 ст.

КАКСАВА́ННЕ, працэс хім. перапрацоўкі паліва (вугалю, торфу, нафтавых рэштак) нагрэваннем без доступу паветра, каб атрымаць *кокс*, гаручы газ і кашт. хім. прадукты.

Адбываецца ў *коксавых печах* і рэактарах з рухомым слоем пры нагрэванні да 1050 °С. Акрамя коксу, пры К. атрымліваюць газападобныя вуглеводароды — высокакаларыйнае паліва і сыравіну для хім. прамысловасці: бензол, талуол, ксілолы, смалістыя рэчывы, пек, а таксама аміяк і серавадарод. Гл. таксама *Каменнавугальная смала*.

Літ.: Тайц Е. М. Свойства каменных углей и процесс образования кокса, М., 1961; Коляндр Л. Я. Улавливание и переработка химических продуктов коксования, 2 изд., Харьков, 1962; Векетов В. П. Удивительные превращения, Липецк, 1963.

КА́КТУСЫ, кактусавыя (Cactaceae), сямейства шматгадовых двухдольных раслін. Вядома 233 роды і каля 5 тыс. відаў, пашыраных пераважна ў Амерыцы. У СССР (у Крыме, Туркменіі, на Каўказе) завезеныя з Паўд. Амерыкі К. (апунцыі) акліматызаваліся і растуць як дэкар. ў адкрытым грунце. На Беларусі К. вырошчваюцца як пакаёвыя і аранжарэйныя расліны.

К.— травы, кусты, радзей дрэвы. Выш. да 20 *м* і да 60 *см* у дыяметры. Сцябло мясістае, вялёнае, розпай формы, укрытае бародаўкамі ці сасочкамі. Лісце амаль ва ўсіх К. рэдукаванае ў калючкі або ў дробныя лусачкі. Кветкі двухполыя, вялікія, яркага колеру, звычайна адзіночныя. Плады ягадападобныя, шматнасенныя. Большасць К.— расліны пустынь і паўпустынь. Размнажаюцца насеннем

Кактусы: *1* — патакактус Атона; *2* — апунцыя дробнаваласістая; *3* — эхінакактус Грузона; *4* — эхінопсіс Эйрыеза; *5* — цэрэус аэтыопс.



і вегетатыўна. Плады і маладыя парасткі некат. відаў (апунцый) ядомыя. К. хілацэраўс, лафафора — лекавыя расліны. У пакаёвай і аранжарэйнай культуры асабліва пашыраны віды родаў К.: апунцыі (Opuntia), мамілярыі (Mamillaria), эхінопсіса (Echinopsis), філакактуса (Phyllocactus) і інш.

Літ.: Дьяконов В. М. и Курнаков Н. И. Кактусы и их культура в комнатных условиях, Л., 1953; Левданская П. И. и Мерло А. С. Комнатные цветочные растения, Мн., 1967; Backeberg C. Wunderwelt Kakteen, 3 Aufl., Jena, 1968.

П. І. Ляўданская. Мінск.

КАКУРЫН Мікалай Яўгенавіч [4(16).9.1883, г. Арол — 27.7.1936], савецкі ваенны дзеяч, гісторык, удзельнік барацьбы за Сав. ўладу на Беларусі. З сям'і афіцэра. Чл. КПСС з 1921. Скончыў Акадэмію Ген. штаба (1910). У 1-ю сусв. вайну палкоўнік. З 1920 у Чырв. Арміі, нач. штаба 8-й і 10-й стралк. дывізій 16-й арміі, камандуючы 4-й і 3-й арміі, пам. камандуючага Зах. фронту; удзельнік баёў супраць войск бурж. Польшчы на Беларусі, узнаг. ордэнам Чырв. Сцяга. З канца 1921 на ваен.-пед. рабоце. Аўтар прац па гісторыі грамадз. вайны ў СССР.

Тв.: Русско-польская кампания 1918—1920 гг., М., 1922; Как сражалась революция, т. 1—2, М.—Л., 1925—26; Стратегический очерк гражданской войны, М.—Л., 1926; Волковысское сражение, М.—Л., 1927; Война с белополяками, 2 изд., М.—Л., 1930.

КАКУШКІНА, гл. *Леніна-Какушкіна.*

КАКЦЫДЫ (Coccodea), падатрад насякомых атр. раўнакрылых. Вядома больш за 4000 відаў, пашыраных ва ўсім свеце. У СССР 500 відаў. На Беларусі вельмі пашырана коскападобная шчытоўка (гл. *Шчытоўкі*).

Даўж. насякомага 0,5—35 *мм*. Самкі недаразвітыя, бяскрылыя, дарослыя нярухома сядзяць на раслінах, укрытыя воскападобнымі выдзяленнямі ў выглядзе лускавінак ці шчыткоў. Як і лічынкі, кормяцца сокамі раслін. Самцы маюць адну пару крылаў, рухомыя, не кормяцца. Небяспечныя шкоднікі садоў, асабліва цытрусавых. З К. дабываюць шэлак (выкарыстоўваецца ў электратэхн. прамысл.), кармін — каштоўны прыродны фарбавальнік.

Літ.: Жизнь животных, т. 3, М., 1969.

КАКЦЫДЫЁЗ, хвароба жывёл (вельмі рэдка чалавека), выкліканая *какцыдыямі*.

Найбольш хварэе маладняк птушак, буйн. раг. жывёлы, трусоў, авечак і коз, якія заражаюцца на пашы, у стойлах праз забруджаны корм ці ваду. Хваробе спрыяе сырасць у памяшканнях, дрэнны корм, пераахалоджванне і скучанасць жывёл. Прыкметы: панос, страта апетыту, прыгнечаны стан, схуднение, анемія. Смяротнасць іншы раз 100%. Лячэнне: сульфаніламідныя і нітрафуролавыя прэпараты, антыбіётыкі. Прафілактыка: правільнае кармленне жывёл, ізаляцыя хворых, абсяшкоджванне памяшканняў. К. жывёл чалавекам не ўспрымаецца. Патагенез, клініку, сезоннасць, паталагічную анатомію, тэрапію К., відавы склад какцыдыяў жывёл у БССР даследуюць у Бел. ветэрынарным НДІ Мін-ва с. гасп. БССР, Віцебскім вет. ін-це і інш.

Літ.: Гобзем В. Р. Видовой состав возбудителей кокцидиозов крупного рогатого скота на территории БССР, у кн.: Инфекционные и паразитарные болезни сельскохозяйственных животных и птиц, Мн., 1964; Pellérdy L. P. Coccidia and Coccidiosis, Budapest, 1965; гл. таксама літ. пры арт. *Какцыды*.

У. Р. Гобзем. Мінск.

КАКЦЫДЫІ (Coccidia), атрад адноклетачных жывёл кл. спаравікоў. Пашыраны на ўсёй зямлі.

Форма цела пераважна авальная ці круглая. Жывуць у эпітэліяльных тканках розных органаў жывёл, рэдка — чалавека. Вузкаспецыфічныя паразіты (пэўнаму віду і нават органу ўласцівы пэўны від К.). Многія выклікаюць *какцыдыёз*.

Літ.: Хейсин Е. М. Жизненные циклы кокцидий домашних животных, Л., 1967; Соколов Г. А. Выживаемость ооцист кокцидий овец в условиях белорусской зимы, у кн.: Зооветеринарная наука — производству, Мн., 1968; Иванова П. С., Мандрусов А. Ф. и Карасев Н. Ф. Кокцидии дикого кабана в Белоруссии, у кн.: Вопросы теории и практики ветеринарии и зоотехнии, Мн., 1970.

КАКЦЫНЕЛІДЫ, сямейства жукоў, тое, што *божыя кароўкі*.

КАКЧЭТАЎ, горад, цэнтр Какчэтаўскай вобл. Каз. ССР. Засн. ў 1824 як ваен. паселішча. Вузел чыгунак і аўтамаб. дарог. 84 тыс. ж. (1971). Важны прамысл. і культурны цэнтр Казахстана. Буйныя прадпрыемствы па перапрацоўцы с.-г. сыравіны (мяса- і млынкамбінаты), мех. з-д (выпускае вымяральныя прылады), з-д жалезабетонных канструкцый, з-д кіслародна-дыхальнай апаратуры. Пед. ін-т, агульнатэхн. ф-т Паўладарскага індустр. ін-та; 5 сярэдніх спец. навуч. устаноў. Краязн. музей, Дом-музей В. У. Куйбышава.

КАКЧЭТАЎСКАЯ ВОБЛАСЦЬ, у складзе Каз. ССР. Утворана 16.3.1944. Размешчана на ПнУ рэспублікі. Пл. 78,1 тыс. *км*². Нас. 590 тыс. чал. (1971). Падзяляецца на 15 раёнаў; 4 гарады, 6 гар. пас. Цэнтр г. Какчэтаў.

На ПнУ вобласці раўніна — працяг Зах.-Сібірскай раўніны. Астатнюю частку займае паўн. ўскраіна Казахскага драбнасопачніка выш. да 400 *м*. Найб. высокае Какчэтаўскае ўзв. выш. да 947 *м*. Карысныя выкапні: жалеза, медзь, волата, свінец, нікель, волава, кам. вугаль, тытан, цырконій, спажыўная соль, торф, фасфарыты, буд. матэрыялы. Клімат кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. на Пн —17, на Пд —19, ліп. 19—20 °С. Ападкаў за год ад 230 *мм* на ПдУ да 300 *мм* на Пн. Вегет. перыяд 165—170 дзён. Асн. рэкі: Ішым з правымі прытокамі Аканбурлук і Іманбурлук; Чаглінка, Селеты. Прэсныя (Шаглытэніз) і салёныя (Селетытэніз, Тэке, Калібек) азёры, багатыя на рыбу. Глебы на большай частцы чарназёмныя, на ПдУ — цёмна-каштанавыя, з саланцамі. Пад лесам



4,6% тэр. Насельніцтва — пераважна казахі; рускія, украінцы, беларусы. Сярэдняя шчыльн. 7,6 чал. на 1 *км*². Гарадскога нас. 31%. Гарады: Какчэтаў, Шчучынск, Сцяпняк, Краснаармейск.

Асн. галіны прамысловасці: харчовая, машынабудаўнічая і металаапрацоўчая, будаўнічая, лёгкая. З-ды: механічны, кіслародна-дыхальнай апаратуры, металаканструкцый і інш. ў Какчэтаве, рамонтна-механічны ў Шчучынску, аўтарамонтны ў Сцепняку. Вытворчасць буд. матэрыялаў. Прадпрыемствы рыбнай (Какчэтаў), мясной (Какчэтаў, Шчучынск), масла-сыраробнай, малочнай, мукамольнай, спіртавой, вінаробнай прамысловасці. Валюшна-лямцавыя (Какчэтаў, с. Катырколь) і швейныя (Какчэтаў, Шчучынск) ф-кі. Асн. галіны с. гасп.— збожжавае земляробства, мясамалочная і мяса-воўнавая жывёлагадоўля. У вобласці 24 калгасы і 135 саўгасаў (1.1.1971). Пасяўная пл. ў 1970 (тыс. *га*) 3173,4, з іх пад збожжавымі 2482,7, тэхнічнымі 4,5, агародніна-бахчавымі і бульбай 22,0, кармавымі 664,2. Асн. збожжавая культура пшаніца (2155,1 тыс. *га*). На пач. 1971 (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 590,1 (у т. л. кароў 205,7), свіней 226,3, авечак і коз 688,8, коней 72,4. К. в. вылучаецца танкарунная і паўтанкарунная авечкагадоўляй. Даўж. чыгунак 971 *км* (1970), шашэйных дарог з цвёрдым пакрыццём 2,7 тыс. *км*. Пед. ін-т, агульнатэхнічны ф-т Паўладарскага індустр. ін-та, 11 сярэдніх спец. навуч. устаноў. Курорт «Баравое». Краязнаўчы музей, Дом-музей В. У. Куйбышава. Абл. газеты «Степной маяк» і «Кокшетау правдасы» («Какчэтаўская праўда»).

Літ.: Советский Казахстан, Алма-Ата, 1970.

С. А. Абдрахманаў. Алма-Ата.

КАЛАБАРАЦЫЯНІСТ (ад франц. collaboration супрацоўніцтва), здраднік радзімы, асоба, якая супрацоўнічала з фашыстамі на тэр., захопленых гітлераўскай Германіяй і яе саюзнікамі. Тэрмін К. упершыню ўзнік у Францыі, часовы ўрад якой (А. Ф. Петэн, П. Лаваль) пайшоў на пагадненне з нямецка-фаш. акупантамі.

КАЛАБІН Аляксей Іванавіч (н. 19.2.1920, в. Цяраева Суздальскага пав. Уладзімірскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1943. На фронце з 1941. Камандзір кулямётнай роты. Вызначыўся ў Камарынскім р-не Палескай вобл. 2.10.1943 рота на чале з К. пад агнём ворага першая пераправілася на правы бераг Дняпра, выбіла ворага з траншэяў, за 6 гадзін адбіла 8 контратак ворага. К. быў двойчы паранены, але не пакінуў поля бою. Жыве ў Іванаве.

КАЛАВУРАВІЧЫ, вёска ў Качановіцкім с/с Пінскага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр калгаса «Сцяг». За 50 *км* на У ад Пінска, 225 *км* ад Брэста, 24 *км* ад чыг. ст. Парахонск. 319 ж., гасп. 83 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін.

КАЛАГЕ́Н (грэч. kolla клей+gennao ствараю), фібрылярны бялок з групы склерапратэінаў, асноўны кампанент злучальнай тканкі (уваходзіць у састаў калагенавых валокнаў). К. не растваральны ў тыповых для бялку растваральніках. Ад награвання доўгі час з вадою ператвараецца ў жэлацін. У саставе К. амінакіслоты гліцын, пралін, аксіпралін, аланін, плазначная колькасць тыразіну і метыяніну. Утвараецца з пракалагену, які ёсць у многіх органах жывёл.

Літ.: Орехович В. Н. Проколлагены, их химический состав, свойства и биологическая роль, М., 1952; Гауровиц Ф. Химия и функции белков, пер. с англ., М., 1965.

КАЛАГЕНО́ЗЫ, сістэмныя хваробы злучальнай тканкі (сістэмная чырвоная ваўчанка, сістэмная склерадэрмія, дэрматаміязіт, вузельчыкавы перыартэрыіт), з групы *калагенавых хвароб*. Падобныя на рэўматызм. К. спрыяюць доўгае лячэнне алергізавальнымі рэчывамі, ахалоджванні, вакцынацыі, інфекцыі, гіперінсаляцыя, зніжаная рэактыўнасць арганізма. Бываюць вострыя, падвострыя і хранічныя формы з паўторнымі абвастрэннямі і рэмісіямі, прагрэсіраваннем.

Пры сістэмнай чырвонай ваўчанцы (эрытэматоз, Лібмана-Сакса сіндром) — ліхаманка, павелічэнне лімфатычных вузлоў, ружавата-чырвоныя плямы на носе і шчоках, пашкоджанні суставаў, сэрца, нырак, лёгкіх, серозных абалонак. Сістэмная склерадэрмія (склерадэрма, дэрматасклероз) характарызуецца павышанай зябкасцю, спазмамі сасудаў, артралгіямі, зацвярдзеннем скуры і ўнутр. органаў, амімічным, маскападобным тварам, агульнай муміфікацыяй арганізма. Дэрматаміязіт (поліміязіт) — хвароба з сістэмным паражэннем мышцаў, скуры, унутр. органаў з ацёкам і пачырваненнем вакол вачэй (перыарбітальная эрытэма) і артрапатыямі. Адрозніваюць дэрматаміязіт самастойны (ідыяпатычны) і пухлінны (у спалучэнні са злаякаснымі пухлінамі). Вузельчыкавы перыартэрыіт (перыартэрыіт надозны, хвароба Кусмаўля-Меера) з пашкоджаннем сярэдніх і малых артэрый, з ліхаманкай, артралгіямі, бледным скурным покрывам і слізістымі абалонкамі, павялічанымі лімфатычнымі падскурнымі вузламі каля сасудаў, гіпертаніяй. Удакладняюць К. даследаваннямі крыві і біяпсіяй. Лячэнне: глюкакартыкоідныя гармоны (прэднізалон, трыамсіналон, дэксаметазон), вітаміны, хіналінавыя прэпараты (рэзахін, дэлагіл, хларахін, плаквеніл), пры пухлінным дэрматаміязіце — хірург. аперацыі. Бел. дэрмата-венеролаг А. Я. Пракапчук распрацаваў і ўкараніў у практыку метад лячэння акрыхінам сістэмнай чырв. ваўчанкі (гл. *Ваўчанка*).

Літ.: Нестеров А. И. и Сигидин Я. А. Клиника коллагеновых болезней, 2 изд., М., 1966 (бібліягр.); Тареев Е. М. Коллагенозы, М., 1965; Прокопчук А. Я. Лечение красной волчанки акрихином, Мн., 1939; Красная волчанка, Мн., 1967.

І. І. Ганчарык. Мінск.

КАЛАГЕ́НАВЫЯ ХВАРО́БЫ, хваробы, пры якіх бывае аднароднае сістэмнае пашкоджанне злучальнай тканкі, асабліва прамежкавага яе рэчыва: валокнаў, якія ўтрымліваюць калаген. Да іх належаць *калагенозы, рэўматызм*, рэўматоідны артрыт.

КАЛАДЗЕ Карло Раждзенавіч [н. 16(29).3. 1904, Кутаісі], грузінскі савецкі паэт і драматург, адзін з пачынальнікаў грузінскай пралетарскай паэзіі. Чл. КПСС з 1939. Друкуецца з 1920. Пясняр новай Грузіі («Заклік да Усходу», 1926; «Дар'ял», 1926), будаўніцтва сацыялізма (цыкл вершаў «Хертвіскія досведкі», паэма «Учардыёні», 1933, і інш.), дружбы народаў і міру (цыкл «Песні на беразе Дняпра» і інш.). Тэмы Айч. вайны ў аснове паэт. цыкла «Сустрэчы на ратным полі» (1942). Вялікае месца ў паэзіі К. займае любоўная лірыка, вясковы пейзаж (цыкл «Ізноў у роднай вёсцы»). Аўтар вершаў для дзяцей, п'ес «Як гэта было» (1929), «Хатыджэ» (1930), «Дом на беразе Куры» і інш.

Тв.: Рус. пер.— Избранное, Тбилиси, 1955; Стихи.

Песни. Баллады, М., 1957; На холмах Грузии, Тбилиси, 1959; Стихотворения, М., 1963; За час до старости, Тбилиси, 1967; Стихи, Тбилиси, 1967.
Літ.: Маргвелашвили Г. Г. Карло Каладзе, Тбилиси, 1958.

КАЛАЗУБЫ, вёска ў Варанілавіцкім с/с Пружанскага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр калгаса «1 Мая». За 55 *км* на ПнУ ад Пружан, 160 *км* ад Брэста, 33 *км* ад чыг. ст. Іванцэвічы. 438 ж., гасп. 127 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. У час бурж. Польшчы ў К. дзейнічалі падпольныя арг-цыі КПЗБ і КСМЗБ. Помнік воінам-аднавяскоўцам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

КАЛАМІЙЦАВА Таццяна Міхайлаўна [н. 20.7(2.8).1914, Пецярбург], беларускі савецкі дырыжор. Нар. арт. БССР (1964). Скончыла Адэскую кансерваторыю ў 1936. У 1937—39 дырыжор-асістэнт Дзярж. сімф. аркестра СССР, у 1941—43 педагог Паўн.-Асецінскай опернай студыі пры Маск. кансерваторыі. У 1944—46 і з 1952 дырыжор Бел. т-ра оперы і балета (у 1946—52 дырыжор сімф. аркестра Беларускай філармоніі). Музычны кіраўнік пастановак беларускіх нацыянальных твораў «Аповесць пра каханне» (1953) і «Палымяныя сэрцы» (1955) В. Залатарова, «Падстаўная нявеста» Г. Вагнера (1958), «Алеся» Я. Цікоцкага (1967), «Выбранніца» Я. Глебава (1969), многіх класічных і сав. опер і балетаў, у т. л. «Яўген Анегін» (1954) і «Пікавая дама» (1960) П. Чайкоўскага, «Арэстэя» С. Танеева (1963), «Трубадур» Дж. Вердзі (1964), «Багема» Дж. Пучыні (1968), «Заручыны ў манастыры» (1962) і «Золушка» (1965) С. Пракоф'ева. К.-дырыжора вызначаюць воля, тэмперамент, артыстызм. У 1955 гастралявала ў Польшчы. Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі.



Літ.: Нісневіч І. Таццяна Каламійцава, у кн.: Слова пра майстроў сцэны, Мн., 1967.

КАЛАМОЕЦ Андрэй Піліпавіч (н. 17.7.1923, в. Успенка Успенскага пав. Екацярынаслаўскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1943. На фронце з 1942 — лётчык-штурмавік. Зрабіў 106 баявых вылетаў. Удзельнік вызвалення Оршы, Барысава, Мінска. Пры ліквідацыі Мінскага «катла» група на чале з К. знішчыла 3 склады з боепрыпасамі, 60 аўтамашын, 3 бензацыстэрны. Жыве ў Маскве.

КАЛАМОРФНЫЯ АГРЭГАТЫ, мінеральныя агрэгаты, утвораныя з калоідных растворaў. Мінералы, якія складаюць К. а., аморфныя ці крыпталічныя (халцэдон, апал, гідрагётыт, хрызакола, гліністыя мінералы і інш.).

Лічаць, што К. а. ўтвараюцца пераважна ў кары выветрывання пры асаджэнні высокадысперсных гліністых часцінак (гл. *Глінa*), ад замяшчэння гліністым рэчывам абломкаў карбанатных парод пры вышчалочванні, радзей — пры магматагенных працэсах. На Беларусі К. а. поліміперальныя, пераважна круглявай ці валакніста-лускавінкавай формы, памерам ад 0,1 да 5 *см*, трапляюцца пераважна ў ілювіяльным гарызонце (гл. *Ілювій*).

Літ.: Чухров Ф. В. Коллоиды в земной коре, М., 1955; Парфенова Е. И. и Ярилова Е. А. Минералогические исследования в почвоведении, М., 1962.

КАЛАНАДА (франц. colonnade), рад калон, аб'яднаных гарызантальным перакрыццём. К. можа быць самастойным збудаваннем, часткаю будынка (*порцік, перыптэр*) або прылягаць да яго як галерэя. Служыць таксама для аздаблення інтэр'ера.

КАЛАНАТ (позналац. colonatus ад colonus земляроб), асаблівая форма вытворчых адносін у Рымскай імперыі, пры якой беззямельныя сяляне з'яўляюцца арандатарамі буйных землеўладальнікаў. Паяўленне К. было выпікам крызісу рабаўладальніцкага спосабу вытворчасці, які прывёў да абеззямельвання сялян, росту буйнога землеўладання. Частку зямель па-ранейшаму апрацоўвалі рабы, частка арандавалася.

К. уласцівы дзве стадыі развіцця. У 2 ст. да н. э.— 1 ст. н. э. арэндная плата была грашовая. Юрыдычна калоны — свабодныя грамадзяне, маглі апрацоўваць зямлю рукамі рабоў, займаць пасады ў суседніх гарадах і аднаўляць арэндны дагавор па сваім жаданні. З 2 ст. арэндная плата набыла натуральную форму. З дробнага рабаўладальніка калон ператвараецца ў непасрэднага вытворцу. Залежнасць яго ад землеўладальніка ўзмацняецца. Крызіс рабаўладальніцкага грамадства ў 3 ст. садзейнічаў пашырэнню К. Калоны страцілі шэраг правоў свабодных людзей, былі прымацаваны да зямель. З розных па юрыд. і сац. паходжанні груп залежнага сельскага насельніцтва ўтварылася саслоўе, якое займала становішча паміж рабамі і свабоднымі. К. стаў папярэднікам сярэдневяковага прыгоннага права. Пашырыўся таксама ў раннім сярэдневякоўе ў Зах. Еўропе і Візантыі.

Літ.: Энгельс Ф. Паходжанне сям'і, прыватнай уласнасці і дзяржавы, Маркс К. і Энгельс Ф. Выбраныя творы, т. 2, Мн., 1952; Рановіч А. Колонат в римском законодательстве II—V вв., «Вестник древней истории», 1951, № 1.

Ф. М. Нячай. Мінск.

КАЛАНДР (франц. calandre), машына, на якой выраблюць лісты ці пласціны з розных матэрыялаў (паперы, гумы, пластмас), надаюць ім гладкасць, глянцавітасць, шчыльнасць, наносяць на іх малюнкі і ўзоры.

К.— прэс, які складаецца з некалькіх пар валкоў, размешчаных адна над адною. Матэрыял, які перамяшчаецца між валкамі, набывае неабходныя ўласцівасці ад сціскання і пругкага слізгання ў зоне прасавання. Прыцісканне валкоў адбываецца рычагова-грузавымі, пнеўматычнымі ці гідраўл. прыстасаваннямі. Выкарыстоўваецца ў вытворчасці тэкстылю, паперы, гумы, пластмасы.

Літ.: Лукач Ю. Е., Рябинин Д. Д. и Метлов Б. Н. Валковые машины для переработки пластмасс и резиновых смесей, М., 1967; Резиносмесители и каландровые линии зарубежных фирм, М., 1961.

КАЛАНІЯЛІЗМ, сістэма паліт. і эканам. прыгнечання, эксплуатацыі народаў залежных краін пануючымі класамі капіталіст. дзяржаў. Выяўляецца ў падзеле свету на невял. колькасць поўнаўладных краін-метраполій і мноства бяспраўных калоній і паўкалоній, якія ператвараюцца ў прыдатак эканомікі капіталіст. дзяржаў. У пагоні за прыбыткам капіталізм па-варварску эксплуатуе прыродныя і працоўныя рэсурсы калан. краін, стрымлівае іх эканам. і культ. развіццё, асуджае на бяспраўе, галечу і нават на выміранне цэлыя плямёны і народы. Узнікненне і развіццё К. непасрэдна звязана са станаўленнем і развіццём *капіталізму*. Як і капіталізм, К. прайшоў перыяды зараджэння, росквіту і заняпаду. Кожны перыяд вызначаецца сваімі мэтамі, формамі і метадамі калан. эксплуатацыі.

К. эпохі першапачатковага накаплення капіталу атрымаў развіццё пасля *Вялікіх геаграфічных адкрыццяў* і адпавядае панаванню гандл. капіталу. Буржуазіі для пашырэння прадпрыемніцкай дзейнасці, умацавання свайго становішча патрэбны былі вял. сродкі. Таму з адкрыццём заморскіх краін пачаліся неприкрыты грабеж, захоп зямель, гандаль рабамі, прымусовае выкарыстанне працы туземцаў на плантацыях і рудніках, падатковыя наборы, канфіскацыі. Сваё панаванне еўрап. захопнікі ўсталёўвалі ўзбр. сілай, лютасцю і злачынствамі. «Адкрыццё залатых і сярэбраных прыскаў у Амерыцы — пісаў К. Маркс,— выкараненне, заняволенне і пахаванне жывымі туземнага насельніцтва ў рудніках, першыя крокі да заваявання і разграблення Ост-Індыі, ператварэнне Афрыкі ў запаведнае поле палявання на чарнаскурых — такая была раніцня зара капіталістычнай эры вытворчасці» (Капітал, т. 1, Мн., 1952, с. 742).

Першыя пачалі калан. заваяванні Партугаліі і Іспаніі. Да пач. 17 ст. калан. ўладанні Партугаліі ўключалі вял. прыбярэжныя тэрыторыі ў Афрыцы, Азіі і Паўд. Амерыцы. Іспі. калоніі ахоплівалі Вест-Індыю і большасць тэрыторыі Паўд. і Цэнтр. Амерыкі. З сярэдзіны 17 ст. ў калан. заваёвах вызначаецца Галандыя, якая захапіла большасць партуг. калоній на Усходзе. У 2-й пал. 17 ст. асноўнымі калан. дзяржавамі сталі Англія і Францыя, у пач. 18 ст. калан. гегемонія непадзельна перайшла да Англіі. За кошт рабавання калоній Паўн. Амерыкі залатыя запасы Еўропы ў 1500—1600 павялічыліся прыкладна в 90 *т* да 1000 *т*. За 3,5 ст. з Афрыкі вывезена і прададзена ў рабства больш як 10 млн. туземцаў. У 1783—93 гандляры Ліверпула перавезлі на сваіх суднах у Амерыку больш як 300 тыс. рабоў.

К. эпохі даманапаліст. капіталізму супадае з умацаваннем прамысл. капіталу. На гэтай стадыі побач з прамым ограбленнем захопленых тэрыторый калоніі выкарыстоўваліся пераважна для збыту тавараў і як крыніцы сыравіны. Калан. эксплуатацыя ад знешнеэканам. метадаў прымусу пераходзіць да эканамічных, пераважна ў форме неэквівалентнага гандл. абмену. Заняволеныя краіны ператвараюцца ў састаўную частку сусв. капіталіст. гаспадаркі, у яе аграрна-сыравінны прыдатак. Заканчваецца фарміраванне асн. калан. імперый.

Асабліва вострая барацьба за калоніі адбываецца ў апошнюю чвэрць 19 ст., у перыяд пераростання капіталізму ў імперыялізм. Побач з ранейшымі калан. краінамі ў барацьбу за калоніі ўключаюцца ЗША, Германія, Італія і інш. Да канца 19 ст. свет быў падзелены паміж групай капіталіст. дзяржаў: у калан. залежнасці была амаль уся Афрыка, значная частка Азіі, шэраг краін Лац. Амерыкі. Калан. ўладанні асобных дзяржаў былі ў шмат разоў большыя за дзяржавы-метраполіі па тэрыторыі і колькасці насельніцтва. К. перарос у сусв. сістэму калан. прыгнечання і фін. задушэння большасці нас. зямлі. Гэта садзейнічала прамысл. развіццю, узбагачэнню капіталіст. краін. У 1720—1889 абарот іх знешняга гандлю вырас з 88 млн. ф. ст. да 3377 млн., а знешнегандл. абарот Вялікабрытаніі амаль у 60 разоў.

К. эпохі імперыялізму адпавядае панаванню фінансавага капіталу. Утварэнне калан. сістэмы імперыялізму азначае найвышэйшую ступень у развіцці К. Увесь свет трапіў пад прыгнечанне манаполій: у паліт. адносінах ён падзелены паміж нямногімі імперыял. дзяржавамі, у гаспадарчых — на сферы ўплыву паміж манапаліст. саюзамі і аб'яднаннямі. Асн. формай калан. прыгнечання стаў *вываз капіталу*. Паміж імперыял. дзяржавамі абвастрылася барацьба за сферы, дзе можна прыкладаць капітал, за сферы выгадных здзелак, манапольных прыбыткаў. Але паколькі «незанятых» сфер у эпоху імперыялізму няма, калан. экспансія набывае форму барацьбы паміж імперыял. дзяржавамі за перадзел свету. Гэта характэрная імперыялізму супярэчнасць ляжала ў аснове паліт. і ваен. крызісаў, была адной з асн. прычын 1-й і 2-й сусв. войнаў.

Нераўнамернае развіццё імперыял. краін вяло да ўзнікнення ці расшырэння адных і аслаблення ці знікнення іншых калан. імперый, да пастаяннай змены паліт. карты свету (гл. табл.). Пасля 1-й сусв. вайны поўнасцю страціла свае калан. ўладанні Германія, значна расшырылі свае імперыі Вялікабрытанія, Францыя, Італія, зацвердзілася як калан. дзяржава Японія, з'явіліся новыя калан. краіны з ліку брытанскіх даміній — Аўстралійскі Саюз, Новая Зеландыя, Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка. Барацьба за страчаныя калоніі, за перараз мерканне калан. і залежных краін, за зняволенне суверэнных дзяржаў была адным з рухальных матываў для развязвання 2-й сусв. вайны германска-італьян. фашызмам і яп. мілітарызмам.

З уступленнем капіталізму ў перыяд яго агульнага крызісу пачалося крушэнне калан. сістэмы. Вырашальную ролю ў развіцці гэтага працэсу мела перамога Вял. Кастр. сацыяліст. рэв., якая пачала эпоху нац.-вызв. рэвалюцый у калан. і залежных краінах. Пад уплывам Кастр. рэв. пачаўся ўздым вызв. барацьбы ў Кітаі, Індыі, Карэі, Інданезіі, Афга-

Каланіяльныя ўладанні асноўных імперыялістычных краін
(тэр.— млн. км²; насельніцтва — млн. чал.)

Метраполіі	Каланіяльныя ўладанні							
	1900		1923		1938		1970	
	тэрыторыя	насельніцтва	тэрыторыя	насельніцтва	тэрыторыя	насельніцтва	тэрыторыя	насельніцтва
Бельгія	2,4	9,0	2,4	10,2	2,4	14,8	—	—
Вялікабрытанія	32,7	367,5	35,2	407,4	14,5	454,0	1,1	11,8
Германія	2,6	12,0	—	—	—	—	—	—
Іспанія	0,2	0,7	0,3	0,9	0,3	1,0	0,27	0,2
Італія	0,5	0,7	2,2	1,7	3,4	8,0	—	—
Нідэрланды	2,0	37,9	2,0	52,5	2,0	67,7	0,1	0,5
Партугалія	2,1	7,7	2,1	8,8	2,1	9,5	2,1	13,5
ЗША	1,9	8,8	1,8	12,0	1,5	2,4	0,01	2,9
Францыя	11,0	50,1	12,2	56,4	12,3	70,0	0,1	1,4
Японія	—	—	0,3	21,4	0,3	31,8	—	—

ністане, Егіпце, Сірыі, Іраку, Іране, Турцыі, Манголіі і ў інш. краінах. Манголія стала на шлях некапіталіст. развіцця. Новы этап крызісу калан. сістэмы пачаўся ў перыяд 2-й сусв. вайны і пасля яе. Разгром герм. і італьян. фашызму, мілітарысцкай Японіі, рэзкае аслабленне амаль усіх капіталіст. дзяржаў, перамога народных і народна-дэмакр. рэвалюцый у шэрагу краін Еўропы і Азіі і ўтварэнне сусв. сацыяліст. сістэмы стварылі спрыяльныя ўмовы для барацьбы прыгнечаных народаў за нац. вызваленне. Пачаўся распад калан. сістэмы імперыялізму, які першапачаткова ахапіў Азію, а з 50-х г. Афрыку і Лац. Амерыку. У 1943 аб'яўлена незалежнасць Сірыі і Лівана. У 1945 дабіліся незалежнасці В'етнам і Інданезія. Вял. ўплыў на далейшае развіццё нац.-вызв. барацьбы прыгнечаных народаў Азіі і інш. краін свету зрабілі вызваленне ад калан. залежнасці Індыі (1947), а затым перамога нар. рэвалюцыі ў Кітаі (1949). На антыкалан. рух у Афрыцы моцна паўплывала вызваленне ад паўкалан. залежнасці Егіпта (1952). Перамога *Кубінскай рэвалюцыі 1959* актывізавала нац.-вызв. барацьбу ў Лац. Амерыцы. У выніку крушэння калан. сістэмы з'явілася больш як 70 новых суверэнных дзяржаў. Калі ў 1919 на калан. і залежныя краіны прыпадала 72% тэр. зямнога шара і 69% насельніцтва свету, то да 1970 пад калан. прыгнечаннем асталося менш як 4% тэр. і 1,1% насельніцтва свету. Народы апошніх калоній — Анголы, Мазамбіка, Гвінеі (Бісаў) і інш. — вядуць барацьбу за нацыянальнае вызваленне. Маладыя дзяржавы, якія ўзніклі ў працэсе ліквідацыі калан. сістэмы, як правіла, трымаюцца антыімперыял. палітыкі, падрываюць устоі імперыялізму, умацоўваюць сілы міру і прагрэсу. Барацьба за нац. вызваленне ў многіх краінах стала практычна перарастаць у барацьбу супраць эксплуататарскіх адносін як феад., так і капіталістычных. Пры падтрымцы сіл сусв. сацыяліст. сістэмы некаторыя краіны, якія вызваліліся ад калан. прыгнечання, сталі на шлях некапіталіст. развіцця. Аднак у многіх краінах, якія заваявалі паліт. незалежнасць, імперыялісты захоўваюць значныя, а падчас і пераважныя эканам. пазіцыі, ужываюць новыя метады і формы эксплуатацыі раней прыгнечаных імі народаў (гл. *Неакаланіялізм*).

Літ.: Маркс К. и Энгельс Ф. О колониальной системе капитализма, М., 1959; Ленин В. И. О национальном и национально-колониальном вопросе, М., 1956; Праграма Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Мн., 1961; Колониализм сегодня. Справочник, М., 1967; Шигер А. Г. Политическая карта мира (1900—1965). Справочник, 2 изд., М., 1966; Ягодкин Г. Новое на карте зарубежного мира. Справочник, 1969, М., 1969; Тягуненко В. Л. Проблемы современных национально-освободительных революций, 2 изд., М., 1969; Искендеров А. А. Национально-освободительное движение, М., 1970; Гаўрылюк В. В. Наша эпоха — эпоха бурных нацыянальна-вызваленчых рэвалюцый, Мн., 1962; Калинина Э. А. и Серебренников В. П. Крушение колониальной системы империализма и образование независимых государств, Мн., 1971. *В. В. Гаўрылюк.* Мінск.

КАЛАНІЯЛЬНЫЯ АРГАНІЗМЫ, жывёлы і расліны, якія пры бясполым размнажэнні ўтвараюць калоніі (аб'яднанні асобін з агульным для ўсіх членаў абменам рэчываў).

Калоніі бываюць манаморфныя (усе арганізмы аднолькавыя, напр., у асцыдый) і паліморфныя (з рознымі па форме і функцыях членамі, напр., калоніі імшанак). Пашыраны пераважна сярод прымітыўных водных арганізмаў (бактэрый, водарасцей, губак, кішачнаполасцевых). Большасць каланіяльных арганізмаў прымацаваныя да субстрату (напр., гідроідныя і каралавыя паліпы). На думку вучоных, К. а.— пераходная форма ад аднаклетачных да шматклетачных арганізмаў у эвалюцыйным развіцці. Калоніямі наз. таксама згуртаванні насякомых, птушак, млекакормячых (пчаліная сям'я, птушыная калонія).

Літ.: Беклемишев В. Н. К проблеме индивидуальности в биологии. Колонии у двусторонне симметричных животных, «Успехи современной биологии», 1950, т. 23, в. 1.

КАЛАНОК (Mustela sibirica), млекакормячая жывёла сям. куніцавых атр. драпежных. Пашыраны ў Азіі і Усх. Еўропе. У СССР — у Сібіры, на Урале, у Прыўраллі.

Даўж. цела да 40, хваста калля 20 *см*. Прыземісты, гібкі. Поўсць густая, пушыстая, светла-рыжая, губы і падбародак белыя. Насяляе пераважна тайгу і лесастэп, у горах падымаецца да альпійскай зоны. Жыве ў норах. Корміцца дробнымі грызунамі. Прыплод — 2—10 дзіцянят. Кашт. пушны звярок (выкарыстоўваецца футра, з валасоў хваста робяць пэндзлі для жывапісу). Іл. гл. на ўкл. да арт. *Драпежныя звяры.*

Літ.: Колосов А. М., Лавров Н. П. и Наумов С. П. Биология промысловых зверей СССР, М., 1965.

КАЛАНТАЙ Аляксандра Міхайлаўна [20.3(1.4).1872, Пецярбург — 9.3.1952], дзеячка міжнароднага жаночага руху, рэвалюцыянерка, савецкі дыпламат. З сям'і генерала. Чл. КПСС з 1915. У рэвалюц. руху з 90-х г. 19 ст. У 1906—15 далучалася да меншавікоў. У 1908—17 у эміграцыі, удзельнічала ў с.-д. руху Англіі, Германіі, Італіі, Францыі, Швецыі, Нарвегіі, ЗША. З сакавіка 1917 член выканкома Петраградскага Савета. Актыўная ўдзельніца Кастр. рэвалюцыі, у 1917 была ў Магілёве; нарком сац. забеспячэння ў 1-м складзе СНК. У 1920 заг. жанаддзела ЦК РКП(б), у 1921—22 сакратар Міжнар. жаночага сакратарыята пры Камінтэрне. Падзяляла погляды «левых камуністаў» (1918), удзельнічала ў «рабочай апазіцыі» (1920—21). К.— першая ў свеце жанчына-пасол; у 1923—26, 1927—30 паўпрад і гандл. прадстаўнік СССР у Нарвегіі, 1926 — у Мексіцы, у 1930—45 пасланнік, пасол у Швецыі, з 1945 саветнік МЗС СССР. На VI з'ездзе РСДРП(б) выбрана чл. ЦК. Аўтар мемуараў і прац пра жаночы рэвалюц. рух. Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі.



Літ.: Ленін У. І. Тв., т. 35, 36 (Полн. собр. соч., т. 49, 50); Миндлин Э. Не дом, но мир, М., 1970.

КАЛАПС (у астраноміі), працэс катастрафічнага сціскання нябеснага цела (напр., зоркі) пад дзеяннем уласных сіл прыцяжэння. Калапсуюць і трацяць мех. ўстойлівасць тыя зоркі, якія вычарпалі сваё ядз. паліва і маса якіх

перавышае 1,2 масы Сонца (М⊙). Пры К. сілы прыцяжэння значна перавышаюць процідзейныя сілы ціску. К. суправаджаецца магутным нейтрынным і антынейтрынным выпрамяненнем. У дастатковa моцным гравітацыйным полі эфекты агульнай тэорыі адноснасці становяцца асноўнымі і К. зоркі пераходзіць у рэлятывісцкі (пры даволі вялікай ступені сціскання). Існуюць прычыны спынення К. да пераходу ў рэлятывісцкі, калі шчыльнасць рэчыва ў цэнтры зоркі парадку 10^{12} *г/см*³. Спыненне К. адбываецца нераўнамерна, так што ў прастору выкідваецца масіўная абалонка зоркі; мяркуецца, што з гэтым звязаны ўспышкі *звышновых зорак*. Ядро зоркі, якое асталося пасля ўспышкі, пры масе, меншай за 1,6 М⊙, пераходзіць ў *нейтронную зорку* (гэты эфект звязваецца з *пульсарамі*); пры масе, большай за 1,6 М⊙, К. хутка ўзнаўляецца, пераходзіць у рэлятывісцкі і заканчваецца стварэннем застылай зоркі.

Літ.: Зельдович Я. Б. и Новиков И. Д. Релятивистская астрофизика, М., 1967.

У. С. Імшэнік. Масква.

КАЛАПС у медыцыне (лац. collapsus аслабелы), стан раптоўнай рэзкай слабасці з прыгнечаннем цэнтральнай нервовай сістэмы, зніжэннем артэрыяльнага і вянознага ціску крыві ад крывацёку, інфаркту міякарда, інфекцый і інтаксікацый (тыф, запаленне лёгкіх, алкагольнае атручэнне, празмерныя дозы нітрытаў).

Расшыраюцца крывяносныя сасуды ў брушной поласці, кроў збіраецца ў печані і селязёнцы, памяншаецца кровазабеспячэнне (гіпаксія і гіпаксемія) сэрца і цэнтр. нерв. сістэмы. Прыкметы: раптоўная слабасць, бледная і халодная скура, т-ра цела да 35 °С, прытомнасць звычайна не траціцца (гэтым К. адрозніваецца ад *непрытомнасці*). Лячэнне: оксігенатэрапія, лякарствы для стымулявання кровазвароту і дыхання.

Літ.: Давыдовский И. В. Общая патология человека, 2 изд., М., 1969; Вальдман В. А. Артериальные дистонии и дистрофии, Л., 1961 (бібліягр.). *В. М. Жаўрыд.* Мінск.

КАЛАРАДА (Colorado), рака ў ЗША і Мексіцы. Даўж. 2740 *км*, пл. бас. 428 тыс. *км*². Пачынаецца ў Скалістых гарах; перасякаючы плато Каларада, утварае глыбокія каньёны (Вялікі каньён і інш.). Упадае ў Каліфарнійскі заліў Ціхага ак. Гал. прытокі: Сан-Хуан, Літл-Каларада, Хіла (левыя). Жыўленне снегавое і дажджавое. Летам у перыяд растання снегу ў гарах рака дае шмат наносаў. Сярэдні гадавы расход вады каля Топак 3811 *м*³/*сек*. ГЭС. Суднаходная ад вусця на 980 *км*. Выкарыстоўваецца на арашэнне і водазабеспячэнне штата Каліфорнія.

КАЛАРАДА (Colorado), штат на З ЗША. Пл. 269,9 тыс. *км*². Нас. 2,2 млн. чал. (1970). Адм. ц. Дэнвер. Вял. гарады: Пуэбла, Каларада-Спрынгс, Боўлдэр.

Сярэднюю частку тэр. штата займаюць хрыбты Скалістых гор з найб. выш. 4399 *м* (г. Элберт), на У заходзіць плато Вялікіх раўнін, на ПдЗ — плато Каларада. Клімат субтрапічны, сухі. Расліннасць стэпавая (У) і паўпустынная (З). У горах хваёвыя лясы. Здабыча урану, ванадыю, малібдэну, кам. вугалю, нафты, прыроднага газу, медзі, свінцу, цынку, золата, серабра. Чорная і каляровая металургія, вытв. горнага абсталявання, машынабудаванне; авіяц.-ракетная, атамная, хім., харч. прамысловасць. Вырошчваюць кукурузу, пшаніцу, ячмень, бульбу, цукр. буракі. Значная частка зямель арашаецца. Садоўніцтва і агародніцтва. Жывёлагадоўля мясного кірунку, пашавал. Транспарт чыгуначны і аўтамабільны. Турызм.

КАЛАРАДСКІ ЖУК, бульбяны жук (Leptinotarsa decemlineata), насякомае з сям. лістаедаў. Радзіма К. ж. Паўн. Амерыка. У СССР выяўлены ў 1949, у БССР у 1956.

Цела К. ж. авальнае, даўж. 9—12 *мм*. Надкрылы аранжавыя з 10 падоўжнымі чорнымі палоскамі. На галаве і пярэднеспінцы цёмныя плямкі. Зімуюць жукі ў глебе на глыб. 20—50 *см*. Яйцы аранжава-чырвоныя (адно пакаленне самкі адкладвае да 2400 яец). Лічынкі чырванаватыя з чорнымі плямкамі на баках, вельмі пражэрлівыя; як і жукі, корміцца лісцем бульбы і інш. паслёнавых; акукліваюцца ў глебе на глыб. 5—12 *см*. К. ж.— небяспечны шкоднік. Меры барацьбы: хімічныя (апырсканне пестыцыдамі поліхлорпіненам і хларафосам у перыяд найб. пашырэння лічынак) і агратэхнічныя (збор яйцакладак, вывядзенне ўстойлівых сартоў і інш.). Іл. гл. на ўкл. да арт. *Жукі*.

Літ.: Дроздов Л. С., Марковец А. Ф. и Пилько М. М. Колорадский жук и меры борьбы с ним, Мн., 1960; Определитель насекомых Европейской части СССР, т. 2, М.—Л., 1965.

В. Ф. Самерсаў. Мінск.

КАЛАРАТУРА (італьян. coloratura літар. афарбаванне), 1) вакальная *арнаментыка*. Асаблівым багаццем вызначалася К. ў італьян. оперы 17 — 1-й пал. 19 ст., дзе яна падзялялася на бравурную (шырокія арпеджыо, рулады, скачкі на вял. інтэрвалы) і грацыёзную (дробныя пасажы, мелізмы) і насычала партыі ўсіх галасоў аж да басоў-буфа, часта ператвараючыся ў самамэту. 2) Здольнасць голасу да выканання аздабленняў (адсюль каларатурнае сапрана).

КАЛАРАЎ Васіл Пятроў (16.7.1877, г. Шумен — 23.1.1950), дзеяч балгарскага і міжнар. рабочага руху. Па адукацыі настаўнік. З 1897 чл. Балг. рабочай с.-д. партыі (БРСДП). Узначальваў с.-д. арг-цыі Шумена і Плоўдзіва. З 1905 чл. ЦК БРСДП (цесных сацыялістаў). Удзельнік Штутгарцкага (1907), Капенгагенскага (1910) кангрэсаў 2-га Інтэрнацыянала, *Цымервальдскай канферэнцыі* (1915) і канферэнцыі *Цымервальдскай левай* у Стакгольме (1917). У 1913—23 дэп. парламента. У 1919—23 сакратар ЦК Балгарскай камуніст. партыі. У вер. 1923 адзін з кіраўнікоў антыфаш. ўзброенага паўстання. У 1923—45 у эміграцыі ў Сав. Саюзе. Удзельнічаў у рабоце III—VII кангрэсаў Камінтэрна; у 1922—24 ген. сакратар ВККІ, у 1921—43 чл. Прэзідыума ВККІ. У 1928—39 старшыня Выканкома Сялянскага інтэрнацыянала. У маі 1935 удзельнічаў у рабоце II з'езду КПЗБ, у чэрв. 1937 на XVI з'ездзе КП(б)Б у Мінску выступіў з дакладам пра міжнар. становішча. У 2-ю сусв. вайну адзін з арганізатараў барацьбы балг. народа супраць фашызму. Пасля вяртання на радзіму (9.9.1945) старшыня Нар. сходу Балгарыі (1945—46), старшыня Вялікага нар. сходу (1946—47), у 1947—49 нам. старшыні Савета Міністраў і міністр замежных спраў, з ліп. 1949 старшыня Савета Міністраў НРБ. К.— відны тэарэтык БКП. Д-р эканам. н. (з 1935), правадз. чл. Балг. АН (з 1946).



Тв.: Избрани произведения, т. 1—3, София, 1954—55; С перо и слово за българо-съветската дружба, София, 1947.

Літ.: Гусев Н. Ф. Василь Коларов, М., 1963; Васил Коларов. Биобиблиография, София, 1947.

КАЛАРЫМЕТР (ад лац. calor цеплыня+ +...*метр*), прылада для вымярэння колькасці цеплыні, якая паглынаецца або аддаецца целамі ў фізіка-хімічных працэсах.

Адрозніваюць К. з пераменнай (гл. рыс.) і з пастаяннай т-рай. У першых колькасць цеплыні вызначаецца зменаю т-ры К., у другіх — зменаю колькасці рэчыва, якое перайшло ў інш. агрэгатны стан (напр., выпарылася ці расплавілася).



Схема каларыметра пераменнай тэмпературы: *1* — масіўны металічны блок з заглыбленнем для ампулы, дзе змяшчаецца матэрыял, які даследуецца; *2* — вадзяны тэрмастат; *3* — тэрмапары; *4* — сасуд Дзьюара.

Літ.: Гл. пры арт. *Каларыметрыя.*

КАЛАРЫМЕТРЫЯ, 1) раздзел фізікі, які вывучае метады вымярэння цеплавых эфектаў (колькасці цеплыні) пры розных фіз., хім. і біял. працэсах. Метадамі К. вымяраюцца цеплаёмістасць, цеплавыя эфекты хім. рэакцый, цеплыня фазавых пераходаў, растварэння, змочвання, адсорбцыі, энергія эл.-магн. выпрамянення, радыеактыўнага распаду і і інш. Вымярэнне цеплыні ў інтэрвале т-р ад 0,1 да 4000 К праводзіцца з дапамогаю *каларыметраў.*

2) К. ў біялогіі (біякаларыметрыя), вымярэнне колькасці цеплыні, якая выдзяляецца жывым арганізмам за пэўны час.

Цеплаабмен і цеплаўтварэнне даследуюцца метадам прамой К. (выдзеленае цяпло ўлоўліваюць спец. каларыметрам) і непрамой (колькасць цяпла вызначаюць даследаваннем газаабмену арганізма — вымяраюць вуглякіслы газ, ваду і спажыты кісларод). З дапамогай К. вызначаюць агульны ўзровень энергетычных затрат арганізма. Звесткі выкарыстоўваюцца пры фізіял. даследаваннях і ў дыягностыцы.

Літ.: Попов М. М. Термометрия и калориметрия, 2 изд., М., 1954; Олейник Б. Н. Точная калориметрия, М., 1964; Чередниченко Л. К. Физиологическая калориметрия, М.— Л., 1965; Беркович Е. М. Энергетический обмен в норме и патологии, М., 1964 (бібліягр.); Кальве Э. и Прат А. Микрокалориметрия, пер. с франц., М., 1963.

КАЛАРЫТ (італьян. colorito ад лац. color колер), сістэма колеравых спалучэнняў у мастацкім творы. У жывапісе — характар узаемасувязі ўсіх колеравых элементаў твора, яго колеравая будова, як адзін з сродкаў праўдзівага і выразнага адлюстравання рэчаіснасці.

К. належыць вял. роля ў пазнанні рэчаіснасці, ён — важны сродак маст. выразнасці, служыць мэтам стварэння маст. вобраза ў жывапісе, каляровай графіцы і інш. К. можа ствараца на спалучэнні лакальных колераў і на танальных суадносінах *(тон, валёр).* К., пабудаваны на чырвоных і жоўтых танах, наз. цёплым, на сініх і зялёных — халодным, у залежнасці ад спалучэння фарбаў можа быць спакойны і напружаны.

КАЛАРЫФЕР (ад лац. calor цяпло+fero нясу), прылада для награвання паветра ў сістэмах ацяплення і вентыляцыі.

Паводле спосабу награвання паветра К. падзяляюцца на агнявыя (агнёва-паветраныя), вадзяныя, паравыя і электрычныя; паводле канструкцыі — на пласціністыя, спіральна-рабрыстыя, пялёсткавыя, з гладкіх трубаў і інш. У К. паветра награецца, калі праходзіць уздоўж каналаў, дзе цыркулююць гарачыя газы, вада або пара. Рух паветра можа ствараца вентылятарам. Гл. таксама *Ацяпляльны агрэгат.*

Літ.: Зыскин А. В. Калориферы и воздухоподогреватели в строительстве, Киев, 1961; Сасин В. И. Перспективы развития калориферостроения. Обзор, М., 1970; Библиографический указатель литературы по кондиционерам, вентиляторам и калориферам, М., 1970.

КАЛАСОЎНІК (Bromus), род адна- і шматгадовых травяністых раслін сям. злакавых. Вядома больш за 100 відаў, пашыраных ва ўмераных зонах зямнога шара. У СССР каля 50 відаў, на Беларусі 10.

Сцябло прамое ці прыўзнятае, выш. да 1,5 *м.* Лісце шырокалінейнае, плоскае. Суквецце — раскідзістая мяцёлка. Плод — зярняўка з бароздкаю. Найб. значэнне на Беларусі мае К. безасцюковы (B. inermis), уведзены ў культуру як кашт. кармавая расліна (ураджай сена 50—70 *ц/га*). К. палявы і К. аржаны, гірса — злоснае пустазелле азімых культур. Меры барацьбы: ачыстка насення, правільная агратэхніка.

Літ.: Флора БССР, т. 1, М., 1949.



Каласоўнік аржаны: *1* — ніжняя частка расліны; *2* — суквецце.

КАЛАТОЗАЎ Міхаіл Канстанцінавіч [н. 28.12.1903 (10.1.1904), Тыфліс], рускі савецкі кінарэжысёр. Нар. арт. СССР (1969). Чл. КПСС з 1939. З 1923 працуе ў кіно. Сусв. вядомасць атрымаў фільм «Ляцяць журавы» (1957, Вялікі прыз 11-га Міжнар. кінафестывалю ў Кане, 1958). Фільмы: «Соль Сванетыі» (1930, дакумент.), «Валерый Чкалаў» (1941), «Змова асуджаных» (1950, Дзярж. прэмія СССР 1951), «Верныя сябры» (1954), «Неадпраўлены ліст» (1960), «Я — Куба» (1965), «Чырвоная палатка» (1970). Узнаг. ордэнам Чырв. Зоркі.

Літ.: Кремлев Г. Михаил Калатозов, М., 1964.

КАЛАЎРОТ, 1) прылада для ручнога прадзення лёну, пянькі і воўны. Прыйшоў на змену *верацяну.* Вынайдзены каля 1530 Юргенсам у Германіі. На Беларусі асабліва пашыраны ў 2-й пал. 19 ст. З сярэдзіны 20 ст. выходзіць з ужытку. 2) Зімовая гульня на ледзяной пляцоўцы (гл. ў арт. *Беларускія народныя гульні*). 3) Прыстасаванне для вярчэння свердла, адвёрткі і г. д. пры ручным свідраванні адтулін, закручванні шрубаў і інш.



КАЛАЎРОТКІ (Rotatoria), клас беспазваночных жывёл, які далучаецца да групы ніжэйшых чарвей. Найменшыя прадстаўнікі шматклетачных. Вядома 1500 відаў. Касмапаліты.

Даўж. жывёл 0,04—2,5 *мм.* Цела рознай формы, двухбаковасіметрычнае, укрытае кутыкулай. Большасць мае галаву, тулава і нагу. У галаўным аддзеле цела калаўротны апарат (сістэма раснічак, з дапамогай якіх К. перамяшчаюцца і ўцягваюць у рот ежу). Ёсць стрававальная сістэма (асабліва характэрна жавальная глотка — мастакс), выдзяляльная (пара протанефрыдыяў) і нервовая (некалькі гангліяў). Раздзельнаполыя. Большасць адкладвае яйцы. Ёсць жывародныя. Развіццё прамое. У жыццёвым цыкле чаргуецца партэнагенез і полавае размнажэнне. Кожнаму віду ўласціва пэўная колькасць клетак (напр., Epiphanes senta мае 959 клетак). К. пераважна паліфагі. Ёсць драпежнікі. Адзіночныя ці каланіяльныя, плаваюць ці прымацаваныя, да субстрату. Калаўроткамі корміцца планктонаедная моладзь рыб.



Калаўротка Synchaeta pachipoda.

Літ.: Кутикова Л. А. Коловратки фауны СССР, Л., 1970. *Г. А. Галкоўская.* Мінск.

КАЛАЦІЛАЎ Леанід Аляксеевіч (1895, с. Пакроўскае Екацярынбургскага пав. Пермскай губ.— 11.7.1965), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). Чл. КПСС з 1942. У Чырв. Арміі з 1918. Удзельнік грамадз. вайны. У Айч. вайну мінамётная брыгада пад камандаваннем ген.-м. К. вызначылася каля Лоева Гомельскай вобл. Падтрымліваючы часці 69-й стралковай дывізіі ў час фарсіравання Дняпра, брыгада знішчыла 20 артыл. і мінамётных батарэй, 31 кулямёт, 2 процітанкавыя гарматы, заглушыла 11 мінамётных батарэй, 34 кулямёты.

КАЛАЦІЧЫ, вёска ў Барысаўшчынскім с/с Глускага р-на Магілёўскай вобл., на р. Пціч. Цэнтр саўгаса «Глускі». За 4 *км* на Пн ад Глуска, 174 *км* ад Магілёва, 35 *км* ад чыг. ст. Ратміравічы, каля шашы Глуск — Глуша (0,5 *км*). 608 ж., гасп. 212 (1971). Раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі. Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, сталовая, магазін. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

КАЛАЧ Барыс Піліпавіч (н. 11.8.1923, чыг. ст. Гародня Чарнігаўскай губ.), Герой Сав. Саюза (1945). З сялян. Чл. КПСС з 1949. У партыз. укр. злучэнні А. Ф. Фёдарава з сак. 1942 — камандзір аддзялення, дыверсійнай групы атрада. Дзейнічаў на Украіне і Беларусі. Пусціў пад адхон 11 варожых эшалонаў. З крас. 1944 удзельнік барацьбы з ням.-фаш. захопнікамі ў Чэхаславакіі. Працуе дырэктарам сярэдняй школы ў Гомелі.



КАЛАЧЫ, вёска ў Янушкавіцкім с/с Лагойскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр саўгаса «Селішча». За 28 *км* на ПнЗ ад Лагойска, 68 *км* ад Мінска, 55 *км* ад чыг. ст. Смалявічы. 179 ж., двароў 55 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, сталовая, швейная і шавецкая майстэрні, магазін. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны.

КАЛАЧЫК Уладзімір Міхайлавіч (н. 24.7.1930, в. Мароські Маладзечанскага пав.), гасп. дзеяч. Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1955. Скончыў Бел. с.-г. акадэмію (1963). У 1955—57 сакратар Маладзечанскага РК ЛКСМБ, з 1957 старшыня калгаса «Светлы шлях» Маладзечанскага р-на Мінскай вобл. На XXVII з'ездзе КПБ выбраны чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета СССР 6-га скл., Вярх. Савета БССР 8-га скл. Нам старшыні Вярх. Савета БССР (1971). Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Кастр. Рэв., медалямі.



Тв.: У правільным кіраўніцтве калгасам — залог поспеху, Мн., 1962; Картофель — 250 центнеров с гектара, Мн., 1967.

КАЛАЧЫНСКІ Міхась [Міхаіл Іванавіч; н. 30.12.1916 (12.1.1917), мяст. Крупка Барысаўскага пав. Мінскай губ.], беларускі савецкі паэт. Чл. КПСС з 1942. З сялян. Скончыў курсы пры Камуністычным ін-це журналістыкі (Мінск, 1936). Працаваў адказным сакратаром газ. «Літаратура і мастацтва». У 1938—53 у Сав. Арміі. Удзельнік сав.-фінляндскай вайны 1939—40, у Айч. вайну армейскі журналіст. У пасляваенны перыяд карэспандэнт газ. «Защитник Родины» (Адэса, 1945—47), літ. сакратар газ. «Во славу Родины» (1947—53). Адказны сакратар праўлення СП БССР (1954—58), у 1958—60 нам. старшыні праўлення СП БССР. З 1960 гал. рэдактар час. «Беларусь». Друкуецца з 1932. Першыя кнігі для дзяцей «Косця-чэкіст» (1938) і «Пакет» (1939). У зб. «Сонца ў блакіце» (1949) услаўляе подзвігі сав. воінаў. Тэмы любові да Радзімы, стваральнай працы сав. людзей, барацьбы за мір, дружбы народаў у кн. «Прыпар» (1956), «Сосны і дзюны» (1960), «Паясы» (1968). Аўтар твораў для юнацтва «Насустрач жыццю» (1951), «На лясным паўстанку» (1955), «Прыгоды Патапкі» (1958), «Лясныя казкі» (1967), «Мая мазаіка» (1971), тэкстаў песень, сцэнарыяў дакументальных фільмаў. Перакладчык з іншых моў. Узнаг. 4 ордэнамі, медалямі.



Тв.: У вялікім паходзе, Мн., 1952; Гронка рабіны. Выбранае, Мн., 1964; За палямі, за лясамі, Мн., 1969; Выбр. тв., т. 1—2, Мн., 1971; Размова па шчырасці, у кн.: Пяцьдзесят чатыры дарогі, Мн., 1963.

Літ.: Семашкевіч Р. Вершы і час, «Полымя», 1965, № 5; Вялевіч А. Лаўры рэчак і дарог, там жа, 1969, № 10. *Дз. І. Гальмакоў.* Мінск.

КАЛАШНІКАЎ Іван Абрамавіч (1922, с. Ступіна Паўлаўскага пав. Варонежскай губ.— 27.7.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). У Чырв. Арміі з 1941. Вызначыўся ў чэрв. 1944 у Магілёўскай вобл. Сержант К. з аддзяленнем першы пераправіўся цераз р. Проню, захапіў плацдарм і памог пераправе палка; у баі на шашы Магілёў — Мінск адбіў 2 контратакі ворага. Загінуў у баі.

КАЛАШНІКАЎ Мікалай Сямёнавіч [5(18).12.1913, г. Пішпек Сямірэчанскай вобл.— 14.8.1944], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1941. У Чырв. Арміі з 1935, на фронце з 1942. Вызначыўся ў Віцебскай вобл. 26.6.1944 батальён аўтаматчыкаў на чале з К. разам з танкамі адрэзаў каля Талачына адыход ворагу па шашы Орша — Мінск. За 4 дні баёў аўтаматчыкі і танкісты знішчылі 2 чыг. эшалоны, 190 аўтамашын, 5 танкаў, 35 бронетранспарцёраў. Загінуў у баі пры вызваленні Літ. ССР.

КАЛАШНІКАЎ Уладзімір Аляксандравіч (н. 5.3.1923, Мінск), беларускі савецкі акцёр тэатра лялек. Засл. арт. БССР (1967). Пасля заканчэння Бел. тэатр.-маст. ін-та (1951) у Дзярж. т-ры лялек БССР. Характарны акцёр. Сярод роляў: Дзед, Кароль Дурымонт («Дзед і жораў», «Цудоўная дудка» В. Вольскага), Цар («Каваль-вярнідуб» паводле А. Якімовіча), Дзед, Канцлер («Сярэбраная табакерка» паводле З. Бядулі), Дзед («Ліпавічкі» паводле У. Галубка), Кашчэй, Труха, Цар («Краса ненаглядная» Я. Спіранскага), Бармалей («Доктар Айбаліт» В. Карастылёва), Млынар («Хлопчык з Княж-возера» Л. Браўсевіча), Дубавік («Казка пра маленькага Капліка» Н. Гернет).

КАЛБАСІНСКІ ЛАГЕР СМЕ́РЦІ, канцэнтрацыйны лагер, створаны ням.-фаш. захопнікамі ў канцы ліп. 1941 каля в. Калбасіна Гродзенскага р-на Беластоцкай вобл. для масавай загубы ваеннапалонных і мірных сав. грамадзян.

Тэрыторыя ў 50 *га* была абнесена калючым дротам, ахоўвалася сабакамі; вакол лагера былі пастаўлены кулямётныя вышкі. Вязняў трымалі ў 96 зямлянках, кармілі харчовымі адходамі. У лагеры пастаянна знаходзілася каля 36 тыс. чал. Штодня сотні вязняў паміралі ад голаду і катаванняў. Фашысцкія каты, як садысты, распраўляліся з жанчынамі, дзецьмі, старымі. За час існавання лагера ў кожнай з 68 ям-магіл было закопана па 200—300 трупаў. Да ліст. 1942 ням.-фаш. захопнікі загубілі тут каля 18 тыс. сав. грамадзян.

Кр.: Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии 1941—1944, 2 изд., Мн., 1965, с. 324. *А. І. Валаховіч.* Мінск.

КАЛБУНО́Ў Уладзімір Акімавіч [н. 2(15).9.1911, в. Растоўка Омскай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). На фронце з 1941. Вызначыўся ў Камарынскім р-не Палескай вобл. Ноччу 30.10.1943 група разведчыкаў з К. фарсіравала Дняпро, акапалася на плацдарме, адкрыла агонь па ворагу, гэтым адцягнула ўвагу праціўніка ад пераправы палка. Жыве ў г. Мірны Якуцкай АССР.

КАЛГА́С (калектыўная гаспадарка), кааператыўная арганізацыя сялян, якія добраахвотна аб'ядналіся, каб супольна весці буйную с.-г. вытворчасць на аснове грамадскіх сродкаў вытворчасці і калект. працы. Садзейнічае развіццю прадукц. сіл у вёсцы, індустрыялізацыі с.-г. вытв.; спалучае асабістыя інтарэсы калгаснікаў, калгасаў, дзяржавы. К.— школа камунізма для сялянства.

У розныя перыяды калектывізацыі с. гасп. ў СССР развіваліся тры формы К.: *таварыства па сумеснай апрацоўцы зямлі, камуна сельскагаспадарчая, арцель сельскагаспадарчая.* У 30-я г. найб. была пашырана сельскагаспадарчая арцель. Трэці Усесаюзны з'езд калгаснікаў прызнаў К. адзінай формай кааператыўнай вытворчасці ў сельскай гаспадарцы.

Мэты, асн. прынцыпы арг-цыі і вытв.-гасп. дзейнасці вызначаны *Статутам калгаса.* Ажыццяўляе вытворчасць на зямлі, якая ў СССР з'яўляецца ўсеагульнай дзярж. уласнасцю і перададзена К. бясплатна і на вечнае карыстанне. Разам з зямлёй эканам. асновай К. з'яўляецца каап.-калг. ўласнасць. Першапачаткова яна створана добраахвотным аграмаджваннем сродкаў вытворчасці сялян. У працэсе росту і ўмацавання грамадскай гаспадаркі ўласнасць К. павялічылася і якасна змянілася; яна памнажаецца калект. працай калгаснікаў з дапамогай дзяржавы і сваёй прыродай набліжаецца да агульнанар. уласнасці. Справамі К. кіруе агульны сход калгаснікаў (у вялікіх гаспадарках — сход упаўнаважаных), у перыяд паміж сходамі — праўленне. Для кантролю за дзейнасцю праўлення і службовых асоб выбіраецца рэвізійная камісія. Шырока развіваюцца грамадскія формы кіравання вытворчасцю. К. ажыццяўляе вытв.-гасп. дзейнасць паводле плана, зацверджанага агульным сходам калгаснікаў. У аснове планавання с.-г. вытворчасці К.— дзярж. планы-заказы на продаж прадукцыі с. гасп. Вытв.-фін. дзейнасць К. заснавана на гаспадарчым разліку, шырокім ужыванні матэрыяльных і маральных стымулаў. Асн. форма арг-цыі працы і вытворчасці — вытв. брыгада (гл. *Брыгада сельскагаспадарчая*). Аплата працы — у адпаведнасці з колькасцю і якасцю працы, укладзенай кожным калгаснікам у грамадскую гаспадарку. З 1966 у К. уведзена гарантаваная аплата працы. Для паспяховага развіцця вытворчасці і задавальнення патрэб калгаснікаў ствараюцца адпаведныя фонды (гл. *Фонды калгасаў*). Грамадская гаспадарка К. развіваецца на навук.-тэхн. аснове. К. маюць свае машынна-трактарныя і аўтамаб. паркі, электрагаспадарку, рамонтныя майстэрні. Праца калгаснікаў становіцца разнавіднасцю індустр. працы, зменьваецца прафес.-кваліфікацыйная структура К.: павялічваецца колькасць кваліфікаваных работнікаў і спецыялістаў. На ўсіх этапах развіцця К. Сав. дзяржава памагае ім набываць тэхніку, рамантаваць яе, забяспечвае электраэнергіяй, пастаўляе мінер. ўгнаенні, выдае каротка- і доўгатэрміновыя пазыкі на капітальныя ўкладанні і вытв. патрэбы, за свой кошт асушае для К. забалочаныя землі, садзейнічае ў капітальным буд-ве, падрыхтоўцы спецыялістаў. Ме-



Калгас І. 1. Аднаасобнікі адной з беларускіх вёсак падаюць заявы, каб уступіць у калгас. 1931. 2. Вуліца калгаса «Гомельскі пралетарый» Гомельскага раёна. 1937. 3. Абагульванне сельскагаспадарчага інвентару ў калгасе «Перамога» (в. Слабада) Стаўбцоўскага раёна Баранавіцкай вобласці. 1941. 4. Сяўба ў калгасе вёскі Грын Мінскай акругі. 1930. 5. Уборка жыта ў калгасе «Світанне» Жлобінскага раёна. 1937. 6. Дзіцячыя яслі-сад калгаса «Беларуская вясна» Лёзненскага раёна. 1936. 7. Першы калгасны сход пасля Вялікай Айчыннай вайны ў калгасе «Рассвет» Кіраўскага раёна Бабруйскай вобласці. 1945. (Здымкі з фондаў Дзяржаўнага музея БССР.)



1



2



3

Калгас II.

1. Даільная ўстаноўка «Імпульс» на летняй пашы калгаса «Сцяг перамогі» Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці.
2. Сенаўборка ў калгасе «Радзіма» Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці.
3. Групавы метад уборкі збожжа ў калгасе імя XXII з'езду КПСС Гомельскага раёна.
4. Малацьба лёну ў калгасе «Піянер» Капыльскага раёна Мінскай вобласці.
5. Збор садавіны ў калгасе «Гігант» Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці.
6. Жывёлагадоўчы комплекс калгаса «Новы шлях» Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці.



1



2



3



4

Калгас III. 1. Вёска Харціца, цэнтр калгаса «Праўда» Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці. 2. Адзін з пакояў кватэры калгасніцы В. В. Будзько. Калгас «Прагрэс» Гродзенскага раёна. 3. Цэнтр калгаса «Новы быт» Мінскага раёна. 4. У дзіцячым садзе калгаса «Зорка камунізма» Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці. 5. У вестыбюлі палаца культуры калгаса «Савецкая Беларусь» Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці. 6. Бібліятэка калгаса «Камінтэрн» Магілёўскага раёна. 7. Бальніца, пабудаваная на сродкі калгаса «Світанне» Добрушскага раёна Гомельскай вобласці.



4



5

6





5



6



7







Калгас IV. 1. У кафэ вёскі Сноў. Калгас імя Калініна Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці. 2. Урачыстасць («Агеньчык»), прысвечаная заканчэнню ўборкі ўраджаю, у калгасе імя Чырвонай Арміі Віцебскага раёна. 3. Ансамбль песні і танца «Рэчанька» калгаса «Слава працы» Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці. 4. Дом адпачынку калгаса «Рассвет» імя Арлоўскага Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці. 5. Спартсмены калгаса імя Калініна Пінскага раёна Брэсцкай вобласці на трэніроўцы.





рапрыемствы, вызначаныя XXIV з'ездам КПСС па далейшым развіцці с.-г. вытворчасці, накіраваны на ўмацаванне мат.-тэхн. базы К. і саўгасаў. З ростам механізацыі ў К. павялічваецца вытворчасць прадукцыі, змяншаецца яе сабекошт, растуць даходы калгаснікаў (гл. табл.).

Асноўныя паказчыкі развіцця калгасаў БССР

	Адзінка вымярэння	1940	1945	1965	1970
Колькасць калгасаў		10174	9761	2350	2206
Прыпадае на 1 калгас:					
с.-г. угоддзяў	*га*	1027	598	2627	2637
у т. л. пасяўной плошчы	»	285	180	1535	1567
буйной рагатай жывёлы	галоў	75	24	855	1179
у т. л. кароў	»	28	5	331	402
трактароў (у пераліку на ўмоўныя)	шт.	1	0,4	24	38
збожнакасуборачных камбайнаў	»	0,2	0,04	4	7
вытворчых асноўных фондаў с.-г. прызначэння	тыс. руб.	...	...	536,0	903,0
спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй		...	...	4	9
механізатараў		...	...	33	41
Атрымана ў разліку на 1 калгас:					
мяса (у жывой вазе)	*т*	4,9	1,2	91,4	180,2
малака	»	23,5	2,9	592,8	911,5
Ураджайнасць:					
збожжавых і зернебабовых	*ц/га*	6,9	3,9	11,7	17,7
бульбы	»	106,0	32,0	95,0	121,0
Атрымана даходу (у цэнах адпаведных гадоў) на 1 калгас	тыс. руб.	3,6	1,8	329,0	701,0
на 1 калгасны двор	руб.	47,7	23,8	873,0	1870,0

Высокая рэнтабельнасць грамадскай гаспадаркі — аснова росту даходаў і дабрабыту калгаснікаў. Акрамя аплаты працы, за кошт грамадскіх фондаў праўленні К. памагаюць калгаснікам набываць жывёлу, забяспечваць яе кармамі, апрацоўваць прысядзібныя ўчасткі. К. клапоцяцца пра паляпшэнне культ.-быт. умоў жыцця калгаснікаў: будуюць клубы, бібліятэкі, стадыёны, дзіцячыя сады і яслі, жылыя дамы з усімі выгодамі. Большасць цэнтр. вёсак К. паводле ген. планаў забудовы пераўтвараюцца ў гар. пасёлкі. У многіх К. працуюць муз. школы, дамы адпачынку, піянерскія лагеры, музеі. Каб павысіць вытв. кваліфікацыю і культ.-тэхн. ўзровень калгаснікаў, К. за свой кошт накіроўваюць іх вучыцца ў ін-ты і тэхнікумы, прафес.-тэхн. вучылішчы і школы. З цэнтралізаванага саюзнага фонду сац. забеспячэння і з цэнтралізаванага саюзнага фонду сац. страхавання калгаснікаў члены К. атрымліваюць пенсіі па старасці, інваліднасці, з прычыны страты кармільца, жанчыны — дапамогу па цяжарнасці і родах; дапамогу па часовай непрацаздольнасці, пуцёўкі ў санаторыі і дамы адпачынку і інш. льготы. Калгаснікі атрымліваюць аплатны адпачынак. Паводле рашэння агульнага сходу лепшым працаўнікам прысвойваецца званне *заслужаны калгаснік*, у многіх К. устанаўліваюцца персанальныя пенсіі. Каб паўней задаволіць патрэбы сям'і, калгаснікі маюць прысядзібныя ўчасткі.

Многія К. БССР — пастаянныя ўдзельнікі ВДНГ СССР. У 1940 за поспехі ў развіцці грамадскай гаспадаркі калгасы імя БВА Любанскага р-на Мінскай вобл., імя Валадарскага Магілёўскага р-на, імя Тэльмана Брагінскага р-на Палескай вобл. ўзнаг. ордэнам Леніна, калгас «Чырвоны бераг» Аршанскага р-на Віцебскай вобл. ордэнам «Знак Пашаны». У Айчынную вайну 10 тыс. К. БССР былі разрабаваны нямецка-фашысцкімі акупантамі. Некаторыя з К. існавалі і ў час вайны ў *партызанскіх краях і зонах*. Пасля вайны К. з дапамогай дзяржавы адраджаліся і хутка ўмацоўваліся. За поспехі ў развіцці грамадскай гаспадаркі ў 1967—71 у БССР узнагароджаны: ордэнам Леніна — *«Аснежыцкі»* Пінскага, *«Камінтэрн»* Аршанскага, *«Світанне»* Жлобінскага, *«Гвардыя»* Бераставіцкага, *«Рассвет»* імя Арлоўскага Кіраўскага, *«Прагрэс»* Гродзенскага, *калгас «XXI з'езд КПСС»* Мсціслаўскага р-наў; ордэнам Прац. Чырв. Сцяга — *«Перамога»* Баранавіцкага, *калгас імя Чырвонай Арміі* Віцебскага, *калгас імя У. І. Леніна* Гомельскага, *калгас імя М. Ф. Гастэлы* Мінскага, *«Камінтэрн»* Магілёўскага, *«Савецкая Беларусь»* Камянецкага, *калгас імя XXII з'езду КПСС* Гомельскага, *«Чырвоная змена»* Любанскага, *калгас імя С. М. Кірава* Шклоўскага р-наў; ордэнам «Знак Пашаны» — *«Кастрычнік»* Ляхавіцкага, *«Маладая гвардыя»* Міёрскага, *калгас імя У. З. Царука* Карэліцкага р-наў. Гл. таксама *Калектывізацыя сельскай гаспадаркі*. Іл. гл. на ўкл. I—IV.

Літ.: Ленін У. І. Прамова на І з'ездзе земляробчых камун і сельскагаспадарчых арцеляў 4 снежня 1919 г., Тв., т. 30 (Полн. собр. соч., т. 39); Яго ж. Аб кааперацыі, Тв., т. 33 (Полн. собр. соч., т. 45); Примерный устав колхоза, М., 1969; Третий Всесоюзный съезд колхозников 25—27 ноября 1969 г. Стенографический отчет, М., 1970; Трэці з'езд калгаснікаў Беларусі. Стэнаграфічная справаздача, Мн., 1970; Социально-экономические преобразования в Белорусской ССР за годы Советской власти, Мн., 1970; Белорусская ССР в цифрах в 1969 году. Статистический сборник, Мн., 1970.

І. І. Тараканаў, М. П. Цыбулька. Мінск.

КАЛГАС «XXI З'ЕЗД КПСС», спецыялізаваная гаспадарка мяса-малочнага кірунку з развітым ільнаводствам у Мсціслаўскім р-не Магілёўскай вобл. Створаны ў 1959 на базе калгасаў «Чырвонаармеец» і «Чырвоны Кастрычнік». Аб'ядноўвае вёскі *Падлужжа* (цэнтр), Каўшова, Чырвоная Горка, Кудрычы, Мал. Зеціца, Калатовіна, Людагошч, Астрэйкавічы, Міцькаўшчына (усяго 499 двароў).

Мае 4473 *га* зямлі, у т. л. 2427 *га* ворнай. У 1970 на 100 *га* с.-г. угоддзяў атрымана 508 *ц* малака, 200,4 *ц* мяса (у жывой вазе), надой малака ад каровы 3121 *кг*. Ураджай (*ц/га*): збожжавых 36,4, бульбы 157,1, караняплодаў 361,8. У калгасе 32 трактары, 34 грузавыя аўтамашыны, 14 камбайнаў. Валавы даход 2162 тыс. руб., чысты даход 922,9 тыс. руб., аплата чалавека-дня 4 руб. 61 кап., непадзельны фонд (на 1.1.1971) 3101,9 тыс. руб., фонд спажывання 852,6 тыс. руб. Паводле ген. плана перабудовы вёсак цэнтр калгаса пераўтвараецца ў гар. пасёлак. Перадавікам вытворчасці А. Т. *Шакура* і М. М. *Дземідзенка* прысвоена званне Героя Сац. Працы. У 1971 калгас узнаг. ордэнам Леніна. *А. Т. Шакура.* Мсціслаўскі раён.

КАЛГАС ІМЯ XXII З'ЕЗДУ КПСС, спецыялізаваная гаспадарка пладова-агародніннага кірунку ў прыгарадзе Гомеля. Арганізаваны ў 1927. Аб'ядноўвае вёскі *Яроміна* (цэнтр), Касцюкоўка, Новае жыццё, пас. Вішанскі, Клімаўскі (усяго 972 двары).

Мае 4937 *га* зямлі, з іх 1755 *га* ворнай. У 1970 на 100 *га* с.-г. угоддзяў атрымаў 679 *ц* малака, 88,6 *ц* мяса (у жывой вазе). Надой малака ад каровы 3316 *кг*. Ураджай (*ц/га*): збожжавых 32, бульбы 201, агародніны 280. Валавы даход 1 млн. 614 тыс. руб., чысты даход 607,5 тыс. руб., аплата чалавека-дня 4 руб. 18 кап., адлічэнні ў фонд спажывання 963,3 тыс. руб., непадзельны фонд (на 1.1.1971) 2 млн. 893 тыс. руб. У калгасе 37 трактароў, 26 аўтамашын, 11 камбайнаў, інш. тэхніка; 3 клубы, 4 б-кі, спарт. збудаванні, прафілакторый, піянер. лагер. Паводле ген. плана перабудовы вёсак цэнтр калгаса пераўтвараецца ў гар. пасёлак. Старшыні калгаса М. П. *Хаванскаму* прысвоена званне Героя Сац. Працы. У 1970 калгас узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга.

Літ.: Производство зерна увеличивается, Мн., 1967. *М. П. Хаванскі.* Гомельскі раён.

КАЛГАС ІМЯ М. Ф. ГАСТЭЛЫ, спецыялізаваная гаспадарка малочна-мяснога кірунку ў прыгарадзе Мінска. Арганізаваны ў 1930 (да 1947 «Чырвоны спецыяліст»). Аб'ядноўвае вёскі *Сенніца* (цэнтр), Калядзічы, Капіевічы, Шчытомерычы, Канючыцы, Ураджайная, Лявонцьевічы, Каханаўшчына, Мачулішчы, Падгай. Скарынічы (усяго 767 двароў).

Мае 4688 *га* зямлі, з іх ворнай 3316 *га*. У 1970 на 100 *га* с.-г. угоддзяў атрымаў 1193 *ц* малака, 140 *ц* мяса (у жывой вазе). Надой малака ад каровы 3996 *кг*. Ураджай (*ц/га*): збожжавых 33,8, бульбы 244, караняплодаў 596. У калгасе 39 трактароў, 36 аўтамашын, 20 збожжа-, 3 сіласа- і 10 бульбаўборачных камбайнаў, інш. тэхніка. Валавы даход 1 млн. 996,8 тыс. руб., чысты даход 1 млн. 95,3 тыс. руб., аплата чалавека-дня 5 руб. 33 кап., непадзельны фонд (на 1.1.1971) 3 млн. 816,5 тыс. руб., адлічэнні ў фонд спажывання 885 тыс. руб. Паводле ген. плана перабудовы вёсак цэнтр калгаса пераўтвараецца ў гар. пасёлак. Перадавікам вытворчасці В. П. *Шыманскаму*, М. М. *Валадзько*, А. П. *Мірутку*, Л. М. *Пунтусу* прысвоена званне Героя Сац. Працы. У 1967 калгас узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга.

Літ.: Шиманский В. П. По пути специализации и интенсификации. 2 изд., Мн., 1968. *В. П. Шыманскі.* Мінскі раён.

КАЛГАС ІМЯ С. М. КІРАВА, спецыялізаваная гаспадарка малочна-мяснога кірунку з развітым ільнаводствам у Шклоўскім р-не Магілёўскай вобл. Створаны ў 1937 на базе калгасаў «Пралетарый» і «13-ы Кастрычнік». Аб'ядноўвае вёскі *Славені* (цэнтр), Заполле, Клін, Пронцаўка, Каменка, Мікіцінічы (усяго 557 двароў).

Мае 4003 *га* зямлі, у т. л. 2974 *га* ворнай. У 1970 на 100 *га* с.-г. угоддзяў атрымана 635,7 *ц* малака, 140,5 *ц* мяса (у жывой вазе), надой малака ад каровы 3040 *кг*. Ураджай (*ц/га*): збожжавых 30,9, бульбы 221, ільновалакна 7,1. У калгасе 48 трактароў, 26 грузавых аўтамашын, 29 камбайнаў. Валавы даход 1481 тыс. руб., чысты даход 772,1 тыс. руб., аплата чалавека-дня 4 руб. 35 кап., непадзельны фонд (на 1.1.1971) 2 млн. 490 тыс., адлічэнні ў фонд спажывання 786,6 тыс. руб. Паводле ген. плана перабудовы вёсак цэнтр калгаса пераўтвараецца ў гар. пасёлак. Перадавікам вытворчасці В. Г. *Пархоменку*, К. С. *Макаравай* прысвоена званне Героя Сац. Працы. У 1971 калгас узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга.

В. Г. Пархоменка. Шклоўскі раён.

КАЛГАС ІМЯ У. І. ЛЕНІНА, спецыялізаваная гаспадарка малочна-мяснога кірунку ў Гомельскім р-не. Арганізаваны ў 1929 (да 1931 «Чырвоная ніва»). Аб'ядноўвае вёскі *Палюбічы* (цэнтр), Валатава, Плёсы і пасёлак Калініна (усяго 544 двары).

Мае 3217 *га* зямлі, з іх ворнай 1143 *га*. У 1970 на 100 *га* с.-г. угоддзяў атрымаў 678 *ц* малака, 84,4 *ц* мяса (у жывой вазе). Надой малака ад каровы 3112 *кг*. Ураджай (*ц/га*): збожжавых 26,9, бульбы 134,4, агародніны 320,6. У калгасе 19 трактароў, 14 аўтамашын, 8 збожжа- і 3 бульбаўборачныя камбайны, інш. тэхніка. Валавы даход 932,3 тыс. руб., чысты даход 421 тыс. руб., аплата чалавека-дня 4 руб. 60 кап., адлічэнні ў фонд спажывання 600,5 тыс. руб., непадзельны фонд (на 1.1.1971) 1 млн. 857,2 тыс. руб. Паводле ген. плана перабудовы вёсак цэнтр калгаса пераўтвараецца ў гар. пасёлак. Перадавікам вытворчасці М. І. *Кавалёвай* і Т. В. *Васільковаій* прысвоена званне Героя Сац. Працы. У 1967 калгас узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга.

Літ.: Кузубов Ф. Д. Трудовая победа колхоза имени Ленина, Мн., 1968. *Ф. Д. Кузубай.* Гомельскі раён.

КАЛГАС ІМЯ У. З. ЦАРУКА, спецыялізаваная гаспадарка малочна-мяснога кірунку ў Карэліцкім р-не Гродзенскай вобл. Створаны ў 1949. Аб'ядноўвае вёскі *Яромічы* (цэнтр), Вял. Вобрына, Мал. Вобрына, Болцічы, Даўгінава, Скорычы, Зарэчча, Першамайскі пас. (усяго 606 двароў).

Мае 3284 *га* с.-г. угоддзяў, з іх 1241 *га* ворнай зямлі. У 1970 на 100 *га* с.-г. угоддзяў атрымана 516 *ц* малака, 84,9 *ц* мяса, надой малака ад каровы 2754 *кг*. Ураджай (*ц/га*): збожжавых 35,7, бульбы 137, ільновалакна 6,6. У калгасе 24 трактары, 18 аўтамашын, 6 збожжа- і 1 сіласаўборачны камбайн. Валавы даход 1008 тыс. руб., чысты даход 377 тыс. руб., аплата чалавека-дня 3 руб. 64 кап., непадзельны фонд (на 1.1.1971) 1553,0 тыс. руб., фонд спажывання 655 тыс. руб. Паводле ген. плана перабудовы вёсак цэнтр калгаса пераўтвараецца ў гар. пасёлак. У калгасе 5 клубаў, 5 б-к, 2 фельч.-ак. пункты, стадыён. У 1971 узнаг. ордэнам «Знак Пашаны». *В. В. Бар'яш.* Карэліцкі раён.

КАЛГАС ІМЯ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ, спецыялізаваная гасп. малочна-агародніннага кірунку ў прыгарадзе Віцебска. Арганізаваны ў 1930. Аб'ядноўвае в. *Альгова* (цэнтр), Ананіна, Аўдзеевічы, Батракі (усяго 393 двары).

Мае 2854 *га* зямлі, з іх ворнай 1263 *га*. У 1970 на 100 *га* с.-г. угоддзяў атрымаў 1229,9 *ц* малака, 55,4 *ц* мяса (у жывой вазе). Надой малака ад каровы 3885 *кг*. Ураджай (*ц/га*): збожжавых 33,4, бульбы 181,3, агародніны 240. У калгасе 17 трактароў, 15 аўтамашын, 5 збожжа-, 2 сіласа- і 2 бульбаўборачныя камбайны, інш. тэхніка. Валавы даход 835 тыс. руб., чысты даход 365 тыс. руб., аплата чалавека-дня 4 руб. 64 кап., адлічэнні ў фонд спажывання 489,3 тыс. руб., непадзельны фонд (на 1.1. 1971) 1 млн. 806 тыс. руб. Паводле ген. плана перабудовы вёсак цэнтр калгаса пераўтвараецца ў гар. пасёлак. З 1956 штогодні ўдзельнік ВДНГ СССР. Старшыні калгаса М. І. *Кацу* прысвоена званне Героя Сац. Працы. У 1967 калгас узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга.

Літ.: Кац М. И. Трудом всего достигнешь, Мн., 1968. *М. І. Кац.* Віцебскі раён.

КАЛГАСНАЕ ПРАВА, галіна сацыяліст. права, якая рэгулюе адносіны па арганізацыі і дзейнасці калгасаў, а таксама адносіны калгасаў з калгаснікамі, арганізацыямі і прадпрыемствамі. Як самастойная галіна права ўзнікла на базе нацыяналізацыі і калектывізацыі с. гасп. (канчаткова склалася ў 1938).

Унутрыкалгасныя адносіны, якія рэгулюе К. п., складваюцца паміж калгасам, калгаснымі дварамі і асобнымі калгаснікамі на аснове членства ў калгасе, на базе калг. уласнасці і калект. працы. Апроч членскіх адносін, існуюць маёмасныя, працоўныя, кіраўнічыя і зямельныя. К. п. рэгулюе адносіны паміж асобнымі калгасамі, а таксама паміж пэўнымі дзярж. органамі і калгасамі. Органы кіравання калгасамі дзейнічаюць паводле прынцыпаў калг. дэмакратыі. Дзярж. кіраўніцтва ажыццяўляецца з дапамогай акрэсленых прававых метадаў: непасрэднага прадпісання, рэкамендацыі і санкцыянавання. Найб. пашыраны метад — рэкамендацыі, што абумоўлена кааператыўнай прыродай калгасаў і іх самакіраваннем. Добраахвотнасць аб'яднання сяляк у калгасы вызначае асаблівасць крыніц К. п., адна з якіх — акты, прынятыя самімі калгасамі (Прыкладны статут калгаса, прыняты III Усесаюзным з'ездам калгаснікаў 27.11.1969, статуты асобных калгасаў). Нормы, якія рэгулююць унутрыкалгасныя адносіны, ёсць у законах і інш. дзярж. актах: сумесныя пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР і саюзных рэспублік з'яўляюцца парт. дырэктывай і нарматыўным актам.

Кр.: Примерный устав колхоза, М., 1969.

Літ.: Козырь М. И. Имущественные правоотношения колхозов в СССР, М., 1966; Карпик В. С. и Сторожев Н. В. Права и обязанности внутриколхозных органов управления, Мн., 1969.

А. А. Шынгель. Мінск.

КАЛГАСНА-САЎГАСНЫЯ ТЭАТРЫ, савецкія вандроўныя прафесійныя тэатры, якія былі спецыяльна створаны для абслугоўвання калгасаў і саўгасаў. Адыгралі значную ролю ў паліт. і культ. развіцці сав. вёскі. Узніклі ў пач. 30-х г. (у 1941 каля 300). Складаліся з прафес. артыстаў і ўдзельнікаў маст. самадзейнасці. Ставілі сав. п'есы, рус. і замежную класіку, творы «малых формаў». У Маскве адбыліся 2 Усесаюзныя агляды К.-с. т. у 1934—35 і ў 1939. На Беларусі першыя К.-с. т. створаны ў Гомелі *(Першы калгасна-саўгасны тэатр)* і Барысаве *(Барысаўскі калгасна-саўгасны тэатр)*. Працавалі: *Полацкі калгасна-саўгасны тэатр, Слуцкі калгасна-саўгасны тэатр* і *Мазырскі калгасна-саўгасны тэатр* з 1936, *Рагачоўскі калгасна-саўгасны тэатр* з 1937, *Заслаўскі калгасна-саўгасны тэатр, Бабруйскі калгасна-саўгасны тэатр* і *Лепельскі калгасна-саўгасны тэатр* з 1938; *Рэчыцкі калгасна-саўгасны тэатр* з 1939; *Дзяржынскі калгасна-саўгасны тэатр* з 1940. У маі 1939 у Мінску адбыўся фестываль К.-с. т. Беларусі. З пач. Айч. вайны спынілі дзейнасць.

Літ.: Тарасов П. Театр колхозной деревни, М.— Л., 1939; Нефед В. Становление белорусского сов. театра, Мн., 1965. *С. А. Пятровіч.* Мінск.

«КАЛГАСНІК БЕЛАРУСІ», назва ў 1931—35 *«Сельской газеты»*.

КАЛГАСНЫ ГАНДАЛЬ, рэалізацыя калгасамі і калгаснікамі с.-г. прадуктаў па цэнах, якія склаліся на рынку; адна з формаў таварнага абарачэння пры сацыялізме.

Непасрэдна дзяржавай К. г. не плануецца і адносіцца да т. зв. неарганізаванага рынку. Эканам. рэгуляванне з боку дзяржавы ажыццяўляецца шляхам развіцця сеткі гарадскіх калг. рынкаў, іх добраўпарадкавання, рознымі паслугамі, а таксама арг-цыяй сустрэчнага гандлю прамысл. таварамі, паралельнага гандлю прадуктовымі таварамі і камісійнага гандлю спажывецкай кааперацыі.

Літ.: Социально-экономические преобразования в Белорусской ССР за годы Советской власти, Мн., 1970, разда. 4. *Л. М. Міхневіч.* Мінск.

КАЛГАСНЫЯ ФОНДЫ, гл. *Фонды калгасаў*.

КАЛГУЕЎ, востраў у паўд.-ўсх. частцы Баранцавага м. Пл. 5,2 тыс. *км²*. Паверхня пераважна раўнінная, у цэнтр. ч. марэнныя грады выш. да 166 *м* над узр. м., складзены з рыхлых чацвярцічных парод. Шмат азёраў і балот. Берагі мала парэзаныя, стромкія. Расліннасць тундравая. Летам гняздоўі птушак. Нас. пункт с. Бугрыно.

КАЛДУНЫ (пыза́, ладо́пікі), страва, вядомая ў беларусаў, палякаў, літоўцаў і інш. народаў. Робяцца з таркаванай бульбы, крутога пшанічнага, жытняга, грэцкага або інш. цеста. Напаўняюцца сырым сечаным мясам (ялавічынай, баранінай) з прыправамі, садавінаю, ягадамі, а таксама вараным бобам, гарохам, цёртым макам, рэпчатай цыбуляй і інш. Згатаваныя ставяцца ў лёгкі дух. Падаюцца ў тлушчы, смятане ці булёне.

КАЛДЫКАРАЕЎ Джумагалы (1922, Туркменская вобл.— 14.1.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). На фронце з 1941. Вызначыўся ў Палескай вобл. 27.9.1943 пад агнём праціўніка на падручных сродках першы фарсіраваў Дняпро каля Камарына, захапіў апорны пункт, чым садзейнічаў фарсіраванню ракі ротаю. Загінуў у баі. Пахаваны ў Мазыры.

КАЛДЫЧЭВА, вёска ў Медзяневіцкім с/с Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр саўгаса «50 гадоў БССР». За 23 *км* на Пн ад Баранавіч, 229 *км* ад Брэста, на аўтамаб. дарозе Баранавічы — Навагрудак. Каля вёскі бярэ пачатак р. Шчара. 398 ж., гасп. 142 (1971). Зверагаспадарка. У 1942 у К. ням.-фаш. захопнікі стварылі *Калдычэўскі лагер смерці*. Помнік на брацкай магіле больш як 22 тысяч сав. грамадзян, закатаваных гітлераўцамі.

КАЛДЫЧЭЎСКАЕ, возера ў бас. р. Шчары, левага прытока Нёмана, у Баранавіцкім р-не Брэсцкай вобл. Пл. 0,55 *км²*. Даўж. 0,95 *км*, найб. шыр. 0,7 *км*, сярэдняя 0,6 *км*, найб. глыб. 2,5 *м*. Катлавіна круглявая, схілы спадзістыя. Дно ілістае, укрыта падводнай расліннасцю. Каля берагоў возера зарастае чаротам, трыснягом, асакой; сцёк у Шчару. Водзяцца плотка, лешч, акунь, шчупак, язь.

Астанкі вязняў Калдычэўскага лагера смерці.



КАЛДЫЧЭЎСКІ ЛАГЕР СМЕРЦІ, створаны ням.-фаш. захопнікамі ў 1942 каля в. Калдычэва Гарадзішчанскага р-на Баранавіцкай вобл. для масавай загубы сав. грамадзян навакольных раёнаў. Быў агароджаны некалькімі радамі калючага дроту. Вязні жылі ў бараках. Дзейнічала спец. камера катаванняў, было 5 цёмных і 7 паўцёмных турэмных камер. У лагеры пастаянна знаходзіліся тысячы сав. грамадзян, якіх забіралі сюды за невыкананне пастаноў і загадаў акупацыйных улад. Іх марылі голадам, непасільнай працай на торфараспрацоўках, збівалі да паўсмерці, гнаілі ў камерах, вешалі і расстрэльвалі. У ноч на 30.6.1944, за некалькі дзён да вызвалення раёна Чырв. Арміяй, фашысты расстралялі вязняў і ўзарвалі асн. памяшканні лагера. У К. л. с. ням.-фаш. акупанты закатавалі больш за 22 тыс. сав. грамадзян. На месцы лагера ў 1964 пастаўлены помнік ахвярам фаш. тэрору. Іл. гл. на с. 251.

Літ.: Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. 1941—1944, Мн., 1965.

А. А. Фактаровіч. Мінск.

«КАЛЕВАЛА» («Kalevala»), карэла-фінскі эпас, збор эпічных нар. карэльскіх, іжорскіх і фінскіх песень (рунаў), складзены як адзінае апавяданне.

Сабраны і выданы фін. вучоным Э. Лёнратам (1835, 1849). Новую кампазіцыю «К.» (на фін. мове) апубл. О. *Куусінен* (1949). Эпас адлюстроўвае побыт і звычаі народа, рысы родавага ладу. Прасякнуты пафасам стваральнай працы, імкненнем да прагрэсу. Раскрывае барацьбу паміж героямі казачных краін — светлай, сонечнай Калевалы і амрочнай, халоднай Пах'ёлы. Героі «К.» — людзі працы. Эпас перакл. на многія мовы народаў СССР, на англ., ням., франц., швед. і інш. мовы.

Публ.: Бел. пер.— Калевала, Мн., 1956; рус. пер.— Калевала, М., 1949; Калевала, М., 1956; Калевала, Петрозаводск, 1970.

Літ.: Евсеев В. Я. Исторические основы карело-финского эпоса, кн. 1—2, М.— Л., 1957—60.

«КАЛЕВІПОЭГ», эстонскі нацыянальны эпас; эпічны твор, напісаны памерам, уласцівым эст. нар. песні.

Матэрыялы эпасу пачаў збіраць эст. пісьменнік і фальклярыст Ф. Р. Фельман. Склаў «К.» яго ідэйны паплечнік і сябар Ф. Р. Крэйцвальд. Упершыню апубл. ў 1857—61. Новае выд. выйшла ў 1862. «К.» змяшчае 20 песень, больш за 19 тыс. верш. радкоў. Гал. герой эпасу — нар. асілак Калевіпоэг, у лёсе якога ў казачна-паэт. форме ўвасоблены гістар. лёс эст. народа, яго шматвяковае жыццё ў іншаземнай няволі. Калевіпоэг — заступнік народа ў барацьбе з ворагамі (скандынаўскімі вікінгамі, рыцарамі-крыжакамі) і злымі сіламі прыроды (Рагатым, чарадзеем і інш.). «К.» адыграў важную ролю ў нац.-вызв. барацьбе 19 ст., а таксама ў фарміраванні эст. нац. л-ры.

Публ.: Рус. пер.— Калевипоэг, Таллин, 1961.

КАЛЕГІЯЛЬНАСЦЬ, прынцып дзяржаўнага і гаспадарчага кіравання, пры якім кіраўніцтва ажыццяўляецца групай асоб (калегіяй). Сутнасць яго ў тым, што ўсе рашэнні па асн. пытаннях кампетэнцыі калегіяльных органаў прымаюцца большасцю галасоў пры шырокім папярэднім абмеркаванні. Павышае аператыўнасць і абгрунтаванасць рашэнняў. У СССР — адно з праяўленняў *дэмакратычнага цэнтралізму.*

На прынцыпе К. ў СССР працуюць вышэйшыя і мясц. органы дзярж. улады: Вярхоўны Савет СССР і Вярхоўныя Саветы саюзных і аўт. рэспублік, Прэзідыумы Вярхоўных Саветаў, мясц. Саветы дэпутатаў працоўных і іх пастаянныя камісіі; выканаўчыя і распарадчыя органы дзярж. улады: Савет Міністраў СССР і Саветы Міністраў саюзных рэспублік, выканкомы мясц. Саветаў; сходы, праўленні калгасаў і іншых каап. арг-цый. Пры міністэрствах ствараюцца калегіі дарадчага характару, рашэнні якіх рэкамендацыйныя. У перыяд пераходу ад сацыялізма да камунізма павышаецца роля К. ва ўсіх звеннях дзярж. і гасп. кіравання. Забяспечваючы шырокае выкарыстанне калектыўнага вопыту, К. пры гэтым не азначае абязлічкі, патрабуе строгай персанальнай адказнасці кожнага за пэўны ўчастак работы. Гл. таксама *Кіраванне.*

Літ.: Ленин В. И. О коллективности руководства, М., 1965.

У. А. Саламовіч. Мінск.

КАЛЕДО́НІЯ (лац. Caledonia), старажытная рымская назва Шатландыі. Упершыню сустракаецца ў творах рым. паэтаў 1 ст. пры апісанні заваявання Брытаніі рымлянамі.

КАЛЕДО́НСКАЯ СКЛАДКАВАСЦЬ (ад назвы гор у Шатландыі), сукупнасць тэктанічных рухаў і звязаных з імі вулканамагматычных працэсаў раннепалеазойскага (кембрый—ранні дэвон) этапа геал. гісторыі Зямлі (ад 500 да 395 млн. гадоў таму назад).

Найб. інтэнсіўна працэсы складкаўтварэння адбываліся ў канцы кембрыю — пачатку ардовіку, на мяжы ардовіку і сілуру і ў позднім сілуры — раннім дэвоне. Вобласці К. с. (каледаніды) захаваліся ў Скандынаўскіх горах, Шатландыі, Уэльсе, на Шпіцбергене, паўн. і ўсх. узбярэжжах Грэнландыі, у Апалачах, ва ўсх. Аўстраліі, у СССР — у Цімансіма кражы, на Пн Цянь-Шаня, Казахстане, Алтае-Салянскай горнай краіне і ўздоўж паўд. і зах. абрамлення Сібірскай платформы. На тэр. Зах. Еўропы, у Кардыльерах і на ПнУ СССР каледонскія структуры дэфармаваны больш позднімі эпохамі складкавасці.

Літ.: Пронин А. А. Каледонский цикл тектонической истории Земли. Хронология тектонических движений, Л., 1969.

М. В. Верацейнікаў. Мінск.

КАЛЕ́Ж (франц. collège), адзін з тыпаў сярэдняй навуч. установы ў Францыі, Бельгіі, Швейцарыі, Канадзе і некат. інш. краінах.

Упершыню засн. ў Францыі ў сярэдніх вякі пры ун-тах. З 1959 у Францыі К. з поўным курсам навучання прыроўнены да ліцэяў. Тэрмін навучання 6—7 гадоў на базе пач. школы. Існуюць: класічны (вывучаюцца старажытныя мовы), «сучасны» К. (вывучаюцца сучасныя мовы), тэхн. К. (4—5-гадовы). Утрымліваюцца мясцовыя ўладамі, грамад. арг-цыямі ці прыватнымі асобамі. Плата за навучанне высокая.

КАЛЕ́ЖСКІ АСЭСАР, гл. ў арт. *Табель аб рангах.*

КАЛЕ́ЖСКІ РЭГІСТРАТАР, гл. ў арт. *Табель аб рангах.*

КАЛЕ́ЖСКІ САВЕ́ТНІК, гл. ў арт. *Табель аб рангах.*

КАЛЕ́КТАР (лац. collector збіральны), 1) у тэхніцы, а) частка ротара ці якара электрарухавікоў і генератараў пастаяннага (часам пераменнага) току, ператваральнікаў частоты і інш.; б) электрод паўправадніковага трыёда (транзістара) і некаторых звышвысокачастотных прылад (напр., клістрона, лямпаў бягучай і адваротнай хваляў); в) у рухавіках унутр. згарання — прыстасаванне для размеркавання гаручай сумесі па асобных цыліндрах (К. усмоктвальны); прыстасаванне для збору і адводу выхлапных газаў з асобных цыліндраў у выхлапную трубу (К. выхлапны); г) труба (рэсервуар), да якой далучаюцца некалькі трубаправодаў меншага дыяметра; д) меліярацыйны цэнтр. канал асушальнай сеткі, да якога далучаюцца больш дробныя каналы. 2) Установа ці асоба, якія збіраюць і размяркоўваюць што-небудзь (напр., бібліятэчны К.).

КАЛЕКТЫВІЗА́ЦЫЯ СЕ́ЛЬСКАЙ ГАСПАДА́РКІ, сацыялістычная перабудова сельскай гаспадаркі шляхам паступовага і добраахвотнага аб'яднання аднаасобных сялянскіх гаспадарак у калектыўныя, адна з галоўных умоў пабудовы сацыялізма. Спараджае ў вёсцы новую сацыяліст. сістэму грамадскіх адносін, якія вядуць да поўнага пераадолення класавых адрозненняў у грамадстве; пазбаўляе працоўнае сялянства ад эксплуатацыі і галечы; умацоўвае саюз рабочых і сялян; забяспечвае ўмовы для ўдзелу сялянства ў кіраванні грамадскай вытворчасцю, у рашэнні агульнадзяржаўных спраў; стварае магчымасць развіваць с. гасп. на індустрыяльнай базе. Навук. аснова К. с. г.— *кааператыўны план Леніна,* формы — калгасы, розныя вытв. кааператывы, заснаваныя на прынцыпах сацыяліст. *кааперацыі.*

На Беларусі, як і ў інш. савецкіх рэспубліках, К. с. г. пачалася пасля перамогі Кастр. рэвалюцыі; падпарадкоўвалася агульным заканамернасцям сацыяліст. пераўтварэнняў с. гасп. краіны; мела перыяд падрыхтоўкі (1917—29) і перыяд суцэльнай калектывізацыі (1929—37). Прававой і эканам. асновай пачатку ўтварэння калект. гаспадарак з'явіліся *Дэкрэт аб зямлі* і закон «Аб сацыялізацыі зямлі». Умовы для развіцця калг. руху стварылі нацыяналізацыя зямлі, індустрыялізацыя краіны і вызначаны аграрнай праграмай КПСС курс на аграмаджванне вытворчасці ў с. гасп. Спачатку каапераванне сялян ажыццяўлялася ў сферы збыту і забеспячэння. Найб. пашырэнне атрымала спажывецкая кааперацыя: на 1.10.1927 яна аб'ядноўвала 41% сялянскіх гаспадарак рэспублікі. Шырока развіваліся крэдытныя таварыствы. У 937 розных с.-г. крэдытных, машынных, меліярацыйных, пасеняводчых і пчалярскіх таварыствах было аб'яднана 177 тыс. сялянскіх гаспадарак. Аднак пануючай формай вытворчасці аставаліся дробныя сялянскія гаспадаркі, якія не задавальнялі патрэб насельніцтва ў прадуктах і прамысловасці ў сыравіне. XV з'езд ВКП(б) вызначыў курс на суцэльную калектывізацыю. У барацьбе супраць трацкізму, правага ўхілу (на Беларусі характэрны хутарызацыйны сялянскіх гаспадарак) партыя падрыхтавала да гэтага ідэйныя і арганіз. ўмовы. Апіраючыся на станоўчы вопыт перших калгасаў, простыя вытв. кааператывы перарасталі ў больш складаныя: ствараліся *таварыствы па сумеснай апрацоўцы зямлі, камуны сельскагаспадарчыя, арцелі сельскагаспадарчыя.* Асн. формай калект. гаспадаркі стала с.-г. арцель, якая найб. удала спалучала грамадскія і асабістыя інтарэсы сялян. Масавае аб'яднанне сялян у калект. гаспадаркі пачалося ў 2-й пал. 1929. У калгасы пайшлі сераднякі. Сав. дзяржава праз створаную сетку *машынна-трактарных станцый* (МТС) умацоўвала тэхн. базу калект. гаспадарак, крэдытавала іх, пасылала ў вёску спецыялістаў с. гасп., рабочых горада, вяла прапагандысцкую і культ.-масавую работу. Першая на Беларусі Койданаўская МТС арганізавана вясной 1930, у 1937 было 200 МТС, якія абслугоўвалі ўсе с.-г. арцелі. Прыкладам буйной с.-г. вытворчасці для сялян былі *саўгасы.* Яны гадавалі для калгасаў племянную высокапрадукцыйную жывёлу, прапагандавалі сярод сялян агранамічныя і заатэхн. веды, арганізацыйна памагалі весці грамадскую гаспадарку. К. с. г. праходзіла ў вострай класавай барацьбе з кулацтвам, у якой загінула многа лепшых важакоў і арганізатараў калгасаў. Поспехі ў індустрыялізацыі краіны, рост калгасаў і саўгасаў далі магчымасць Сав. уладзе перайсці ад палітыкі абмежавання і выцяснення кулацтва да палітыкі ліквідацыі яго як класа на базе суцэльнай калектывізацыі. Далейшаму развіццю і арганіз. ўмацаванню калект. гаспадарак садзейнічаў прыняты ў 1935 Прыкладны статут с.-г. арцелі. З 1936 у БССР пачалося перасяленне гаспадарак з хутароў, водруббаў і дробных пасёлкаў на цэнтр. калг. сядзібы (да 1940 пераселена больш як 155 тыс. гаспадарак). Пад канец 2-й пяцігодкі БССР мела значныя поспехі ў К. с. г. (гл. табл.).

Паказчыкі калгаснага будаўніцтва ў БССР

	1928	1932	1937
Калектывізацыя бядняцка-серадняцкіх гаспадарак (на 1 красавіка), у % да агульнай колькасці	0,7	43,7	87,5
Арганізавана калгасаў	994	каля 9000	больш як 9600
Колькасць сялянскіх гаспадарак у 1 калгасе	9,2	36,5	71,0
Удзельная вага калгасаў у паслуўных плошчах рэспублікі	0,7	48,7	96,0

За 1928—32 павялічыліся нарыхтоўкі збожжа ў 1,7 раза, бульбы амаль у 3 разы, лёну (валакна) у 2,7 і мяса ў 2,6 раза. У Вял. Айч. вайну бел. калгасы былі разрабаваны і знішчаны (гл. *Акупацыйны рэжым*). Пасля Айч. вайны разам з аднаўленнем калгасаў праведзена калектывізацыя ў зах. абласцях, уз'яднаных у 1939 з БССР, ажыццёўлена ўзбуйненне калгасаў, прыняты меры для далейшага развіцця і ўмацавання калг. ладу. Вопыт калг. буд-ва ў СССР выкарыстоўваюць краіны, якія сталі на шлях сацыялізма. Пры пераўтварэннях с. гасп. яны, улічваючы свае асаблівасці, развіваюць розныя формы кааперавання, забяспечваюць перарастанне прасцейшых формаў кааперацыі ў вышэйшую. Гл. таксама *Калгас.*

Літ.: Ленін У. І. Аграрнае пытанне і «крытыкі Маркса», Тв., т. 13 (Поли. собр. соч., т. 5); яго ж. Аграрная праграма сацыял-дэмакратыі ў першай рускай рэвалюцыі 1905—1907 гг., Тв., т. 13 (там жа, т. 16); яго ж. Прамова на I Усерасійскім з'ездзе зямельных аддзелаў, камітэтаў беднаты і камун 11 снежня 1918 г., Тв., т. 28 (там жа, т. 37); яго ж. Прамова на I з'ездзе земляробчых камун і сельскагаспадарчых арцеляў 4 снежня 1919 г., Тв., т. 30 (там жа, т. 39); яго ж. Аб кааперацыі, Тв., т. 33 (там жа, т. 45); Власенко Н. В. Борьба Компартии Белоруссии за построение экономического фундамента социализма, Мн., 1970; Мілавана Ў. А. Першыя крокі калгаснага руху ў Беларусі (кастрычнік 1917—1920 г.), Мн., 1958; Социально-экономические преобразования в Белорусской ССР за годы Советской власти, Мн., 1970; Филимонов А. А. Укрепление союза рабочего класса и трудящегося крестьянства в период развернутого строительства социализма (1929—1936 гг.), Мн., 1968; Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 2 (1921—1966), Мн., 1967.

А. А. Філімонаў. Мінск.

КАЛЕКТЫВІЗМ (лац. collectivus зборны), характэрная рыса сацыяліст. і камуніст. грамадскіх адносін і прынцып камуніст. маралі, выражае адносіны супрацоўніцтва, салідарнасці, таварыскай узаемадапамогі людзей, іх адданасць агульнанароднай справе. К. азначае першынство інтарэсаў калектыву, усяго грамадства над асабістымі інтарэсамі, класавую салідарнасць, узаемную падтрымку. Аснова К.—адзінства карэн. інтарэсаў усіх членаў пэўнай супольнасці (калектыву, класа, народа).

Як прынцып паводзін асобы ў калектыве К.— прадукт гістар. развіцця грамадства. У першабытным грамадстве К.— неабходны сродак у барацьбе за існаванне. У класавым грамадстве ў выніку панавання прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці К. выцясняецца *індывідуалізмам,* які становіцца характэрнай рысай бурж. маралі. У той жа час ва ўмовах капіталізму нараджаецца новая фор-

ма К., носьбіт ле — пралетарыят. Перамога пралет. рэвалюцыі, ліквідацыя прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці, рацыянальнае ўсіх грамадзян стварэнне рэальных магчымасці для фарміравання пралет. К. Пры сацыялізме К.— агульны прынцып паводзін людзей ва ўсіх галінах грамадскага жыцця, найважнейшае патрабаванне камуніст. маралі. Гал. сіла калектывісцкага выхавання — працоўны калектыў, дзе ў творчай сумеснай працы фарміруюцца новыя, сацыялістычныя адносіны дружбы і таварыскай узаемадапамогі. Пры сацыялізме К. выяўляецца ў маральна-палітычным адзінстве грамадства, сацыяліст. інтэрнацыяналізме, дружбе і братнім супрацоўніцтве народаў. Прынцып К. азначае высокую меру асабістай адказнасці кожнага чалавека не толькі за свае ўчынкі, але і за ўчынкі іншых — таварышаў, калектыву, усяго грамадства.

Сацыялістычны рэчаіснасць забяспечвае рэальныя магчымасці для гарманічнага спалучэння асабістых інтарэсаў з грамадскімі. Сацыялістычны К.— неабходная ўмова раскрыцця здольнасцей асобы. «Толькі ў калектыве індывід атрымлівае сродкі, якія даюць яму магчымасць усебаковага развіцця сваіх задаткаў, і, значыць, толькі ў калектыве магчыма асабістая свабода» (Маркс К. и Энгельс Ф. Соч., т. 3, с. 75). Таму сцвярджанні бурж. ідэолагаў аб прыгнёце асобы ў калектыве беспадстаўныя. У сацыялістычным грамадстве яшчэ астаюцца ў свядомасці і паводзінах некат. людзей перажыткі капіталізму, элементы эгаізму, аднак па меры пераходу да камунізма яны знікаюць, ідзе працэс сцвярджэння сапраўднага К. «Кожны за ўсіх і ўсе за аднаго» — гэты лозунг К. і таварыскай узаемадапамогі з'яўляецца адным з прынцыпаў маральнага кодэкса будаўніка камунізма.

Літ.: Маркс К. и Энгельс Ф. Немецкая идеология, Соч., т. 3; іх жа. Маніфест Камуністычнай партыі, Мн., 1968; Ленін У. І. Аб нацыянальнай гордасці велікаросаў, Тв., т. 21 (Полн. собр. соч., т. 26); яго ж. Вялікі пачын, Тв., т. 29 (там жа, т. 39); яго ж. Ад разбурэння векавога ўкладу да творчасці новага, Тв., т. 30 (там жа, т. 40); Праграма Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Мн., 1961; Калинин М. И. О коммунистическом воспитании, Мн., 1970; Макаренко А. С. О коммунистическом воспитании, 2 изд., М., 1956; Коллектив и личность, М., 1968; Нравственное развитие личности, М., 1969; Крутова О. Н. Человек и мораль, М., 1970. *М. І. Баровскі.* Мінск.

КАЛЕКТЫЎНАСЦЬ ПАРТЫЙНАГА КІРАЎНІЦТВА, найвышэйшы прынцып паліт. і арганізацыйнага кіраўніцтва ў марксісцка-ленінскіх партыях; неабходная ўмова нармальнай дзейнасці парт. арг-цый, выхавання кадраў, развіцця актыўнасці і самадзейнасці камуністаў. Прынцыпы К. п. к. распрацаваны У. І. Леніным і замацаваны ў *Статуце КПСС*. Тэарэт. асновай К. п. к. з'яўляецца марксісцка-ленінскае вучэнне пра *партыю новага тыпу*, пра вырашальную ролю пар. мас у гістар. працэсе, пра калектыўны вопыт мас як галоўнай і надзейнай крыніцы ведання жыцця і руху наперад. Паслядоўнае ажыццяўленне гэтага прынцыпу дае партыі магчымасць лепш арыентавацца ў вырашэнні складаных пытанняў, умацоўваць свае рады, пашыраць і паглыбляць сувязі з масамі, удасканальваць арганізатар. дзейнасць, спалучаць кіраўніцтва зверху з ініцыятывай шырокіх парт. мас.

Марксізм-ленінізм не адмаўляе ролі лідэраў і правадыроў рабочага класа, іх аўтарытэту, але асуджае ўзвялічванне кіраўнікоў. Прынцып К. п. к. найлепш адпавядае раўнапраўю ва ўнутрыпарт. узаемаадносінах. Ён азначае, што рашэнні па найважнейшых пытаннях, якія прымаюць парт. к-ты, сходы, канферэнцыі, з'езды, з'яўляюцца вынікам калектыўнай творчасці, і кожны чл. партыі абавязаны змагацца за выкананне рашэнняў, ухваленых большасцю галасоў. К. п. к. не адымае персанальнай адказнасці з работнікаў за даручаную справу, патрабуе ад кіраўніка па-партыйнаму рэагаваць на крытыку і прымаць усе захады да выпраўлення памылак, паслядоўна праводзіць *дэмакратыю ўнутрыпартыйную*. З мэтаю ажыццяўлення ленінскага прынцыпу К. п. к. і забеспячэння прыліву ў кіраўніцтве парт. органаў новых кадраў партыя ўвяла ў практыку сістэматычнае абнаўленне складу ўсіх выбарных органаў партыі — ад першычных арг-цый да ЦК з захаваннем пераемнасці кіраўніцтва. К. п. к.— найважнейшая ўмова павышэння ўзроўню парт. работы, умацавання сувязі з масамі, паспяховага ажыццяўлення задач камуніст. буд-ва.

Літ.: Ленин В. И. О коллективности руководства. Сб., М., 1965; КПСС в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК, т. 1—5, 8 изд., М., 1970—71; Брэжнеў Л. І. Пяцьдзесят гадоў вялікіх перамог сацыялізма, Мн., 1967.

А. У. Царук. Мінск.

КАЛЕКТЫЎНАЯ БЯСПЕКА, сумесныя мерапрыемствы дзяржаў па забеспячэнні міру, недапушчэнні агрэсіі і па барацьбе з ёю, якія ажыццяўляюцца праз пэўныя міжнар. арганізацыі або ў інш. парадку ў адпаведнасці з пагадненнямі, заключанымі паміж дзяржавамі. Міжнар.-прававая аснова арганізацыі К. б.— Статут ААН, у якім замацаваны прынцыпы непадзельнасці свету, роўнасці ўсіх краін, павагі іх суверэнітэту, адмаўленне ад тэр. дамаганняў і інш. Існуюць сусветныя арг-цыі К. б. (ААН) і рэгіянальныя (Арганізацыя Варшаўскага дагавору).

Пагадненні пра К. б. уключаюць 2 віды абавязацельстваў: 1) забарона ўзбр. канфліктаў, вырашэнне міжнар. спрэчак мірнымі сродкамі. Гарантыі выканання гэтых абавязацельстваў — усеагульнае і поўнае ці частковае разбраенне, ліквідацыя іншаземных ваенных баз і агрэсіўных ваен.-паліт. блокаў, забарона выкарыстання зброі масавага знішчэння, стварэнне нейтралізаваных, дэмілітарызаваных, бяз'ядзерных зонаў і інш.; 2) узаемныя кансультацыі, адмова памагаць агрэсару, дапамога ахвярам агрэсіі, аж да выкарыстання ўзброенай сілы. Варшаўскі дагавор адкрыты для далучэння інш. дзяржаў незалежна ад іх грамадскага і дзярж. ладу, якія гатовы садзейнічаць аб'яднанню намаганняў міралюбных краін дзеля захавання міру і бяспекі. Агрэсіўныя імперыял. блокі (НАТО, СЕАТО і інш.) не належаць да арг-цый К. б. Гэта замкнёныя ваен.-паліт. групоўкі, якія выкарыстоўваюцца імперыял. коламі для абвастрэння міжнар. напружання, барацьбы супраць сусв. сацыялізма, нац.-вызв. і дэмакр. руху. СССР лічыць К. б. важным сродкам забеспячэння міру і паслядоўна выступае з канструктыўнымі прапановамі па стварэнні рэгіянальных і ўсеагульных сістэм К. б. БССР разам з 8 сацыяліст. краінамі выступіла на XXV юбілейнай сесіі Генеральнай Асамблеі ААН з праектам Дэкларацыі аб умацаванні міжнар. бяспекі. Практ. вырашэнне гэтых праблем натыкаецца на супраціўленне імперыял. дзяржаў.

Літ.: Матэрыялы XXIV з'езда КПСС, Мн., 1971; Собакин В. К. Коллективная безопасность — гарантия мирного сосуществования, М., 1962; Захарова Н. В. Правовые вопросы обеспечения коллективной безопасности в Европе, М., 1959.

А. В. Арлоўскі. Мінск.

КАЛЕКТЫЎНЫ ДАГАВОР, пагадненне паміж адміністрацыяй савецкага прадпрыемства і калектывам рабочых і служачых у асобе ФЗМК, якое вызначае ўзаемныя абавязацельствы па выкананні і неправыкананні вытворчага плана, павышэнні прадукцыйнасці працы, удасканаленні арганізацыі працы, паляпшэнні матэрыяльна-бытавога і культ. абслугоўвання рабочых і служачых, а таксама змяшчае нарматыўныя палажэнні па пытаннях працы і зарплаты, распрацаваныя адміністрацыяй і ФЗМК у межах іх кампетэнцыі. Мэта К. д.— развіваць сацыялістычнае спаборніцтва, пашыраць перадавы вопыт, павышаць кваліфікацыю кадраў, умацоўваць дзяржаўную і працоўную дысцыпліну, адказнасць гаспадарчых і прафсаюзных арганізацый за ахову працы, задавальненне жыллёва-бытавых патрэб працоўных і інш.

Дэкрэт СНК РСФСР ад 2.7.1918 упершыню вызначыў К. д. як нарматыўны акт і рэгламентаваў яго змест. Пытанні заключэння і рэгістрацыі К. д. рэгулююцца пастановай Савета Міністраў СССР і ВЦСПС ад 6.3.1966. Парадак заключэння вызначаецца пастановай ВЦСПС і Дзярж. камітэта па пытаннях працы і заработнай платы ад 1.12.1966, а таксама дырэктыўнымі пісьмамі, якія зацвярджаюцца міністэрствамі і ведамствамі разам з цэнтр. і рэсп. камітэтамі прафсаюза і ў якіх даюцца асн. кірункі К. д. в улікам канкрэтных задач развіцця пэўнай галіны нар. гасп. Вінаватыя ў невыкананні або парушэнні К. д. прыцягваюцца да адказнасці. Аналагічны характар в савецкімі маюць К. д., якія заключаюцца на дзярж. прадпрыемствах у сацыялістычных краінах. У капіталіст. краінах К. д.— пагадненне пра ўмовы працы паміж прафсаюзам і асобнымі прадпрыемцамі або іх аб'яднаннем. Адзін са сродкаў барацьбы рабочых за паляпшэнне свайго эканам. становішча. Капіталісты ўсяляк імкнуцца абмежаваць дзеянне К. д. Бурж. заканадаўства доўга не прызнавала за імі юрыд. сілы. Напр., у ЗША права рабочых аб'ядноўвацца ў прафсаюзы і заключаць К. д. прызнана толькі ў 1935 федэральным законам Вагнера, аднак дзеянне яго значна абмежавана антырабочым *Тафта — Хартлі законам*.

Кр.: Основы законодательства Союза ССР и союзных республик о труде, М., 1970.

Літ.: Семенков В. И. Охрана труда в СССР, Мн., 1970; Пашерстник А. Е. Правовое регулирование труда в капиталистических странах, М., 1955; Москаленко Г. К. Коллективный договор по советскому праву, М., 1960; Киселев Я. Л. Охрана труда по советскому трудовому праву, М., 1962.

В. І. Семянкоў. Мінск.

КАЛЕКТЫЎНЫЯ СРОДКІ ЗАСЦЯРОГІ, спецыяльна абсталяваныя інжынерныя збудаванні (сховішчы) для групавой засцярогі войск і насельніцтва ад радыеактыўных, атрутных, бактэрыяльных і запальных сродкаў, а таксама ад звычайных сродкаў паражэння.

У час баявых дзеянняў для войск найб. эфектыўнае інж. абсталяванне пазіцый і раёнаў размяшчэння войск. Каб засцерагчы насельніцтва, будуюцца сховішчы з фільтравентыляцыяй, а сховішчы, дзе доўга знаходзяцца людзі — в цэнтр. ацяпленнем, водаправодам, каналізацыяй, асвятленнем, радыё. Пад процірадыяц. сховішчы прыстасоўваюцца скляпы, падвалы і інш. гасп. памяшканні.

Літ.: Гл. пры арт. *Засцярога ад зброі масавага паражэння.*

КАЛЕНДУЛА, травяністая ці паўкустовая расліна, тое, што *наготкі*.

КАЛЕНКАВІЧЫ, вёска ў Камянецкім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Праўда». За 24 *км* на ПнЗ ад Камянца, 59 *км* ад Брэста, 18 *км* ад чыг. ст. Высока-Літоўск, на аўтамаб. дарозе, якая злучае вёску з Высокім і г. п. Камянец. 524 ж., гасп. 158 (1971). Швейная майстэрня. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, магазін.

КАЛЕННІКАЎ Васіль Фёдаравіч (н. 10.1. 1921, в. Насовічы Гомельскага пав.), Герой Савецкага Саюза (1945). З сялян. Чл. КПСС з 1944. Скончыў ваен.-авіятэхн. школу (1939). У Айч. вайну на Паўд., Цэнтр., 1-м Бел. франтах — тэхнік, лётчык-штурмавік. Удзельнік баёў на Арлоўска-Курскім напрамку, вызвалення Гомеля, Рэчыцы, Рагачова, Бабруйска, Брэста, Варшавы, штурму Берліна. Забяспечыў і зрабіў 253 баявыя вылеты; знішчыў 56 варожых танкаў, 180 аўтамашын, 66 гармат, 4 паравозы, 4 пераправы, 26 мінамётных батарэй і многа жывой сілы.



КАЛЕННІКАЎ Іван Емяльянавіч (1912, мяст. Навабеліца Гомельскага пав.— 14.8.1969), Герой Сав. Саюза (1944). З рабочых. Чл. КПСС з 1940. Скончыў бранятанкавае вуч. (1937). У Чырв. Арміі з 1933.



Удзельнік вызвалення Зах. Беларусі (1939), сав.-фінляндскай вайны 1939—40. У Айч. вайну на Зах., Калінінскім, Варонежскім, Бранскім, 1-м і 2-м Укр. франтах. Удзельнік контрудару каля г. Сянно Віцебскай вобл. (1941). Вызначыўся на Кіеўскім напрамку. 4—7.11.1943 кіраваў перадавым атрадам танкавай брыгады, якая авалодала чыг. ст. Жуляны, перарэзала шашу Кіеў — Жытомір; 7—8.11.1943 разбіў перадавы атрад варожай танкавай дывізіі.

КАЛЕСА Філарэт Міхайлавіч (17.7.1871, в. Татарскае Стрыйскага пав., Галіцыя — 3.3.1947), украінскі савецкі музыказнавец-фальклярыст, кампазітар, этнограф і літаратуразнавец. Акад. АН УССР (1929). Праф. Львоўскага ун-та імя Франка з 1939. У 1900 скончыў філас. ф-т Львоўскага ун-та, музыцы вучыўся ў А. Брукнера і Г. Адлера (Вена). Зрабіў уклад у развіццё еўрап. фальклярыстыкі пач. 20 ст. фундаментальнай распрацоўкай праблемы суадносін лакальнага і агульнанац. стылю ў фальклоры. У 1910 ажыццявіў даследаванне, запіс і публікацыю ўкр. нар. дум. Вывучаў узаемазалежнасць рытмікі верша і напеву ў нар. творчасці, славянскія фальклорныя сувязі. У 1932 з польск. этнографам К. Машынскім ездзіў на Палессе для запісу фальклору (матэрыялы паездкі апублікаваны ў арт. «Народная музыка на Палессі», дзе К. гаворыць пра цесную сувязь укр. і бел. фальклору). Аўтар зборнікаў апрацовак нар. песень, хар. твораў.

Тв.: Мелодії українських народних дум, Київ, 1969; Музикознавчі праці, Київ, 1970; Фольклористичні праці, Київ, 1970.

Літ.: Квітка К. Філарет Колесса, «Музика», [1926], № 11; Грица С. Філарет Михайлович Колесса, Київ, 1962.

Л. С. Мухарынская. Мінск.

КАЛЕСНІК Іван Іванавіч (н. 9.10.1932, в. Грычына Дзяржынскага раёна БССР), бе-

ларускі савецкі паэт. Чл. КПСС з 1970. З сялян. Вучыўся ў БДУ (1954—58), скончыў Выш. літ. курсы ў Маскве (1967). Працаваў у рэд. газ. «Чырвоная змена», на Бел. радыё, з 1968 у рэдакцыі час. «Маладосць». Друкуецца з 1952. Першы зб. вершаў «Белыя каштаны» (1959). Аўтар зб. «Пяць сузор'яў» (1963), «Калі разам мы» (1967), «Інтэрнат» (1971).

КАЛЕСНІК Станіслаў Вікенцьевіч [н. 10(23).1.1901, Санкт-Пецярбург], савецкі географ і гляцыёлаг. Акад. АН СССР (1968, чл.-кар. 1953), д-р геагр. н. (1938), засл. дз. нав. РСФСР (1961). Чл. КПСС з 1943. Працы па гляцыялогіі і геаморфалогіі Цэнтр. Цянь-Шаня і Джунгарскага Алатау, па тэарэт. пытаннях гляцыялогіі, землязнаўства, фізічнай геаграфіі. З 1935 у Ленінградскім дзярж. ун-це; заг. кафедры фіз. геаграфіі (з 1950), заг. лабараторыі азёразнаўства АН СССР (з 1955), дырэктар Ін-та азёразнаўства АН СССР (з 1971). Прэзідэнт Геагр. т-ва СССР (1964, віцэ-прэзідэнт з 1952). Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, 3 інш. ордэнамі, 2 Залатымі медалямі Геагр. т-ва СССР. Віцэ-прэзідэнт Міжнар. геагр. саюза (1968) і ганаровы член замежных геаграфічных таварыстваў. Імем К. названы 3 ледавікі: у Заілійскім Алатау, Джунгарскім Алатау, на Палярным Урале.

Тв.: Горные ледниковые районы СССР, Л.—М., 1937; Общая гляциология, Л., 1939; Основы общего землеведения, 2 изд., М., 1955; Очерки гляциологии, М., 1963; Общие географические закономерности Земли, М., 1970.

КАЛЕСНІК Уладзімір Андрэевіч (н. 17.9.1922, в. Сіняўская Слабада Навагрудскага пав.), беларускі савецкі крытык і літаратуразнавец. Канд. філал. н. (1958), дац. (1960). Чл. КПСС з 1952. З сялян. Скончыў Мінскі пед. ін-т (1949). У Айч. вайну падпольшчык і партызан Баранавіцкага партыз. злучэння. З 1954 на кафедры бел. л-ры Брэсцкага пед. ін-та. Друкуецца з 1952. Аўтар манаграфіі пра даваенную паэзію М. Танка «Паэзія змагання» (1959). Гал. тэма даследаванняў — творчасць прагрэс. зах.-бел. пісьменнікаў В. Таўлая, М. Васілька, А. Салагуба, М. Засіма, У. Жылкі. Склаў анталогію паэзіі былой Зах. Беларусі «Сцягі і паходні» (1965). Адзін з аўтараў «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры» (т. 1, 1965). Аўтар краязн. нарысаў, артыкулаў пра сучасную і стараж. бел. л-ру. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», медалямі.

Тв.: Час і песні, Мн., 1962; (разам з Ф. М. Янкоўскім) Вусная мова і выразнае чытанне, Мн., 1962; Аповесць пра Таўлая, «Полымя», 1964, № 10, 1965, № 8—9; Партрэт друга, у кн.: Сейбіты разумнага, добрага, вечнага, Мн., 1966; Сваім следам, у кн.: Пра час і пра сябе, Мн., 1966.

В. П. Рагойша. Мінск.

КАЛЕСНІК Уладзімір Рыгоравіч [15(28).6.1911, с. Рожны Асцёрскага пав. Чарнігаўскай губ.— 25.11.1943], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Канд. у чл. КПСС. На фронце з 1941. Вызначыўся ў Палескай вобл. 25.11.1943 экіпаж падбітага танка на чале з К. у 12-гадзінным баі знішчыў 4 гарматы, 7 кулямётных кропак, 2 мінамётныя батарэі. К. загінуў у баі.



КАЛЕСНІКАЎ Віталь Міхайлавіч (15.8.1922, г. Рагачоў Гомельскай губ.— 27.11.1964), Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1944. У Айч. вайну абараняў Негарэлае Мінскай вобл., Прапойск Магілёўскай вобласці. Удзельнік вызвалення Украіны, Беларусі, Польшчы, баёў на Курскай дузе, у Германіі. Вызначыўся ў вер. 1943 у баях за Дняпро ў Камарынскім р-не Палескай вобл. Арганізаваў пераправу роты, якая захапіла плацдарм, прайшла на 6 км, вызваліла в. Вяле, у баі за в. Галкі адбівала ў дзень па 3—4 контратакі.

КАЛЕСНІКАЎ Іван Сцяпанавіч [н. 5(18).11.1911, станіца Новакубанская Кубанскай вобл.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Ген.-м. (1953). Чл. КПСС з 1937. У Чырв. Арміі з 1933. На фронце з 1941. Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра ў Камарынскім р-не Палескай вобл. 30.9.1943 полк пад камандаваннем К. на падручных сродках пераправіўся цераз раку, захапіў плацдарм, адбіў некалькі контратак гітлераўцаў. Жыве ў Маскве.

КАЛЕСНІКАЎ Пімен Рыгоравіч [н. 12(25).7.1906, Мікалаеў], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1931. На фронце з 1941, лётчык-штурмавік. Вызначыўся пры вызваленні Рагачова, Бабруйска, Мінска і ліквідацыі груповак ворага ў Бабруйскім і Мінскім «катлах». Эскадрылля на чале з К. пры прарыве варожай абароны на тэр. Беларусі зрабіла 300 баявых вылетаў. Жыве ў Мінску.

КАЛЕВАЧНЫ СТАНОК (у дрэваапрацоўцы), від *стругальнага станка* (звычайна паўаўтамата) для адначасовага стругання (больш правільна фрэзеравання) драўляных дэталяў з 3 ці 4 бакоў, каб надаць дакладны фасонны профіль дэталям мэблі, аконных і дзвярных пераплётаў, багету і інш.

Літ.: Гл. пры арт. *Дрэваапрацоўчыя станкі.*

КАЛЕСЫ (в о з), сродак гужавога транспарту. Гл. ў арт. *Драбіны.*

КАЛІ (Cali), горад на З Калумбіі, адм. цэнтр дэп. Валье-дэль-Каўка. Засн. ў 1536. Важны гандл.-прамысл. і транспартны цэнтр зах. часткі краіны. Вузел чыг. і шашэйных дарог. 921,7 тыс. ж. (1970). Харч. (асабліва цукр.), тэкст., гарбарна-абутковая, хім., цэментавая, папяровая, металаапр. прамысловасць, вытв. аўтапакрышак. Ун-т.

КАЛІБР (франц. calibre), 1) бяскшкальны вымяральны інструмент для кантролю адхіленняў памераў, формы і ўзаемнага размяшчэння частак вырабаў ад устаноўчай меры. Кантроль робіцца параўнаннем К. з вырабам на ступені прыляганне паверхняў. К. падзяляюцца на рабочыя — для праверкі вырабаў і кантрольныя — для праверкі самих К. Паводле спосабу праверкі бываюць нармальныя (па намінальным памеры) і больш дакладныя граничныя (па найменшым ці найб. дазволеным памеры). Перавагі К.— прастата

кантролю, недахоп — немагчымасць вызначыць сапраўдныя адхіленні памераў. Больш надзейныя — універсальныя сродкі вымярэння, механіз. і аўтам. прылады. Гл. таксама *Вымяральныя інструменты.*

2) Дыяметр канала ствала агнястрэльнай зброі ці снарада (у *мм*, дзюймах). У нарэзной зброі — адлегласць паміж двума процілеглымі палямі нарэзаў ствала. Для паляўнічай гладканстольнай стрэльбы К. азначае колькасць круглых куль, адлітых з 400 *г* свінцу, якія ўкладваюцца ў адзін рад у канале ствала. 3) Паглыбленні на паверхні пракатных валкоў, якія надаюць металу, што абціскаецца, патрэбны профіль.

КАЛІБРОЎКА, 1) наданне дакладных памераў і формы дэталям пластычнай дэфармацыяй у калібровачных штампах. К. гарачакачаных пруткоў робіцца прапусканнем іх праз валачыльны стан (гл. *Валачэнне*), а гарачакачаных трубаў — праз калібровачны стан. К. адтулін робіцца працісканнем праз іх стальнога шарыка ці спец. апраўкі. 2) Методыка вызначэння памераў і формы, разлік і нарэзка на пракатных валках т. зв. калібраў (гл. ў арт. *Калібр*).

КАЛІБРЫ (Trochili), падатрад птушак атр. даўгакрылых. 1 сям., 319 відаў. Пашыраны пераважна ў Цэнтр. і Паўн. Амерыцы. Самыя дробныя птушкі зямнога шара.

Даўж. цела К. 21—30 *мм*, маса найменшых з іх каля 1,6—1,8 *г*. Апярэнне розначаляровае, бліскучае. Дзюба доўгая, тонкая. Вельмі хуткі і пластомна лятаюць. Адносная маса іх сэрца найбольшая ў класе птушак; вельмі інтэнсіўны абмен рэчываў, т-ра цела каля 43 °С. Жывуць К. ў лясах, хмызняках, на лугах, у гарах і стэпах. Нясуць 2 яйцы (маса яйца каля 0,2 *г*.). Наседжваюць 14—19 дзён. Кормяцца нектарам кветак і часткова дробнымі насякомымі. Смокчучы нектар, трымаюцца (завісаюць) у паветры. Пераважна аселыя птушкі. Іл. гл. на укл. да арт. *Птушкі.*

Літ.: Руководство по зоологии, т. 6, М.— Л., 1940; Жизнь животных, т. 5, М., 1970.

КАЛІВА Ганна Данілаўна [н. 12(25).7.1915, в. Каменка Горацкага пав. Магілёўскай губ.], перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1960), заслужаны механізатар Беларускай ССР (1963). Чл. КПСС з 1955. З 1939 трактарыстка Лепінскай МТС, у 1950—70 брыгадзір трактарнай брыгады Горскай МТС, калгасаў «Савецкая Беларусь», «50 гадоў БССР» Горацкага р-на Магілёўскай вобл. Дэп. Вярх. Савета БССР 6-га скл. Жыве на радзіме.



Тв.: Даўгавечнасць машын — справа механізатараў, Мн., 1964.

КАЛІЕЎ Анвар (н. 8.3.1921, в. Тарханы Цюменскага пав. Табольскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). На фронце з 1941, разведчык. Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра ў раёне Лоева. 19.10.1943 у складзе разведгрупы пад агнём ворага першы пераправіўся цераз Дняпро, разведаў лінію абароны праціўніка, перадаў звесткі камандаванню, што памагло палку хутка і без страт фарсіраваць раку. Жыве ў с. Курганчы Аккурганскага р-на Ташкенцкай вобл.

КАЛІЙ (Kalium), K, хім. элемент I групы перыяд. сістэмы Мендзялеева, ат. н. 19, ат. м. 39,102. Належыць да *шчолачных металаў*. Металічны К. упершыню атрыманы ў 1807. Прыродны складаецца з ізатопаў: ^{39}K (93,08%), ^{40}K і ^{41}K. У зямной кары 2,5% па масе, трапляецца толькі ў злучэннях.

К.— серабрыста-белы мяккі, пластычны метал, *t* пл. 63 °С, *t* кіп. 776 °С, шчыльн. 860 *кг/м*³. Хімічна вельмі актыўны. На паветры лёгка акісляецца і бурна ўзаемадзейнічае з вадой. Таму яго захоўваюць пад слоем бензіну, газы ці мінер. масла. Актыўна злучаецца з галагенамі, пры награванні — з вадародам, серай і інш. З азотам не ўзаемадзейнічае. Уваходзіць у састаў мінералаў, якія ўтвараюць прыродныя пласты *калійных соляў*.

Металічны К. ужываецца як каталізатар, сплаў з натрыем — у атамных рэактарах; пераліс К.— для рэгенерацыі кіслароду. К.— адзін з асноўных спажыўных элементаў для раслін (гл. *Калійныя ўгнаенні*). Солі К. ўжываюцца ў шкловарэнні, медыцыне.

Літ.: Коренман И. М. Аналитическая химия калия, М., 1964.

КАЛІЙНЫЯ СОЛІ, асадкавыя горныя пароды, складзеныя з лёгкарастваральных соляў калію, звычайна разам з натрыем, магніем і інш. Асн. мінералы *сільвін, карналіт*, радзей каініт, лангбейніт, шэніт, палігаліт. К. с.— асн. сыравіна, з якой атрымліваюць *калійныя ўгнаенні*, металічны калій і яго злучэнні.

Утварэнне К. с. адбываецца пры выпарэнні ці ахалоджванні расолаў, насычаных каліем, у ізаляваных басейнах, дзе выпарэнне пераважае над паступленнем вады. Паклады К. с. звычайна прымеркаваны да верхніх частак разрэзаў *галагенных фармацый*, дзе яны складаюць пласты і лінзы магутнасцю да некалькіх дзесяткаў метраў. Развіты ва ўпадзінах платформаў, у перадгорных і міжгорных упадзінах складкавых абласцей, у рыфтавых зонах (гл. *Рыфт*), трапляюцца сярод асадкаў сучасных салёных азёраў.

Беларускі каліяносны басейн — другі па велічыні ў СССР. Запасы К. с. у БССР складаюць звыш 20% балансавых запасаў К. с. у СССР. На Пд рэспублікі, у Прыпяцкай упадзіне выяўлены Старобінскае і Петрыкаўскае радовішчы (гл. адпаведныя арт.) у верхнедвонскай каляноснай тоўшчы. К. с. на Беларусі распрацоўваюцца (гл. *Салігорскія калійныя камбінаты*). Найбольшыя радовішчы К. с. звязаны з адкладамі дэвонскай, пермскай, мелавой і неагенавай сістэм. У СССР, акрамя Беларусі, найб. важныя каліяносныя басейны размешчаны на Паўн. Урале (Салікамскі), у Сярэдняй Азіі і на Украіне. Есць таксама ў ФРГ, ГДР, Францыі, Іспаніі, Італіі, Вялікабрытаніі, у Паўн. Амерыцы (ЗША, Канадзе), у Афрыцы (Народнай Рэспубліцы Конга, Эфіопіі), у Азіі (КНР). Вялікія запасы К. с. у расолах Мёртвага мора.

Літ.: Валяшко М. Г. Геохимические закономерности формирования месторождений калийных солей, М., 1962; Геология и петрография калийных солей Белоруссии, Мн., 1969; Иванов А. А. и Левицкий Ю. Ф. Геология галогенных отложений (формаций) СССР, М., 1960; Требования промышленности к качеству минерального сырья, 2 изд., в. 22, М., 1963.

В. З. Кіслік, Ю. І. Лупіновіч. Мінск.

КАЛІЙНЫЯ ЎГНАЁННІ, мінеральныя рэчывы, якія змяшчаюць калій, добра раствараюцца ў вадзе і ўжываюцца для жыўлення с.-г. раслін.

Найб. пашыраны з К. у. хлорысты калій, які змяшчае 52—61,9% K_2O. Атрымліваюць з сільвініту паслі ўзбагачэння яго метадам флатацыі. У БССР К. ў. выпускаюць *Салігорскія калійныя камбінаты*. Ужываюцца 30—40% калійныя солі, 46—52% сульфат калію, сырыя *калійныя солі*, падвойныя сульфаты калію-магнію (24—27% K_2O, 11—18% MgO). Солі калію ёсць у попеле (паташ K_2CO_3), цэментавым пыле (карбанаты і сульфаты калію), нефеліне і адходах пры вытв. магнію. К. ў. неабходны на дзярнова-падзолістых, пясчаных і супясчаных, тарфяна-балотных і лугавых глебах пад бульбу, цукр. буракі, лён, грэчку і інш. культуры. Уносяцца на глыбіню ворнага слоя да сяўбы ад 30 да 100 *кг/га*. К. ў. найб. эфектыўныя, калі ўносяцца разам з азотнымі і фосфарнымі ўгнаеннямі. Наяўнасць хлору ў К. у. некалькі зніжае якасць прадукту (напр., крухмалістасць бульбы).

Літ.: Позин М. Е. Технология минеральных солей, 2 изд., Л., 1961; Справочник по удобрениям, Мн., 1969; Кулаковская Т. Н. Применение удобрений, Мн., 1970; Печковский В. В., Александрович Х. М. и Пинаев Г. Ф. Технология калийных удобрений, Мн., 1968; Александрович Х. М. и Павлюченко М. М. Калийные соли Белоруссии, их переработка и использование, Мн., 1966. *Х. М. Александровіч.* Мінск.

КАЛІКРА́Т (Kallikrátēs; г. п. і см. невяд.), старажытнагрэчаскі архітэктар 2-й пал. 5 ст. да н. э. Пабудаваў на Афінскім акропалі храм Ніке Аптэрас (Бяскрылай Перамогі; 449—421 да н. э.) і разам з *Іктынам* — храм *Парфенон* (447—438 да н. э.). Удзельнічаў у буд-ве Доўгіх сцен (калля 457—445 да н. э.) паміж Афінамі і Пірэем.

КАЛІМАНТА́Н (Kalimantan), Барнео, востраў у Малайскім архіпелазе. Пл. 747 тыс. км². Уваходзіць у склад Інданезіі (б. ч. востраў), федэрацыі Малайзіі (штаты Саравак, Сабах) і Брунея (англ. пратэктарат). Нас. 6,7 млн. чал. (ацэнка, 1969), пераважна малайцы, даякі.

Унутр. раёны пераважна горныя, калля берагоў горы чаргуюцца з алювіяльнымі нізінамі. Найвыш. пункт г. Кінабалу (4101 м) на Пн. Радовішчы нафты, вугалю, жал. руды, золата, алмазаў. Клімат экватарыяльны. Гал. рэкі: Капуас, Барыта, Раджанг. Глебы латэрытныя і балотныя трапічныя. Большая ч. тэр. ўкрыта трапічнымі лясамі. Жывёльны свет: арангутанг, малайскі мядзведзь, індыйскі слон, суматранскі двурогі насарог, птушка-насарог і інш. Многа птушак, паўзуноў. Земляробства, лесапарыхтоўкі. Вываз нафты, каўчуку, копры, перцу, рысу. Гал. порты: Банджармасін, Пантыянак, Кучынг, Балікпапан.

КАЛІНА (Viburnum), род лістападных кустоў або невялікіх дрэў сям. бружмелевых. Вядома калля 200 відаў, пашыраных ва ўмераных і трапічных зонах зямнога шара. У СССР 8 дзікарослых відаў і каля 40 відаў у культуры. На Беларусі адзін дзікарослы — К. звычайная (V. opulus) і 7 відаў інтрадукавана Цэнтр. бат. садам АН БССР.



Каліна звычайная: *1* — галінка з суквеццем; *2* — галінка з пладамі.

К. звычайная — куст або дрэва, выш. да 4 м. Лісце трох-, пяцілопасцевае, па краі буйназубчастае. Кветкі белыя або ружова-белыя, сабраныя ў парасонападобныя мяцёлкі. Пладыяркa-чырвоныя касцянкі, ядомыя. Расце ў лясах і на лугах. Вырошчваецца як дэкаратыўная, асабліва садовая махрыстая форма — бульдзенеж (снегавы шар). Добры меданос. Лекавая расліна (кара мае дубільныя рэчывы, гліказід вібурнін, смолы). Вадкі экстракт кары К. ўжываецца ў медыцыне.

Літ.: Лекарственные растения. Дикорастущие, 4 изд., Мн., 1968; Рыбицкий Н. А. и Гаврилов И. С. Дикорастущие плоды и ягоды, Л., 1969.

Я. У. Іванова. Мінск.

КАЛІНАЎКА, вёска ў Зарубскім с/с Дубровенскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр саўгаса імя Чарняхоўскага. За 18 *км* на У ад Дуброўна, 125 *км* ад Віцебска, 34 *км* ад чыг. ст. Асінаўка, на аўтамаб. дарозе Дуброўна — в. Ляды. 250 ж., гасп. 76 (1971). Дзіцячыя яслі-сад, вет. пункт, сталовая, магазін. У 1943 ням.-фаш. захопнікі спалілі вёску. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў Айч. вайны.

КАЛІНІН Барыс Пятровіч (1913, ст. Пярлоўская Маскоўскага пав.— 10.10.1943), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). Чл. КПСС. На фронце з 1941. Вызначыўся ў Камарынскім р-не Палескай вобл. Узвод на чале з К. адным з першых фарсіраваў Дняпро і ў баях за нас. пункты Зладзеева, Пасудава, Вільямовічы 2—5.10.1943 знішчыў бранявік, станковы кулямёт, амаль ўзвод пяхоты праціўніка. Памёр ад ран.

КАЛІНІН Міхаіл Іванавіч [7(19).11.1875, в. Верхняя Троіца Карчэўскага пав. Цвярской губ.— 3.6.1946], дзеяч Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы, Герой Сац. Працы (1944). З сялян. Чл. КПСС з 1898. Скончыўшы 4-класную школу (1889), працаваў на найме ў памешчыка. З 1893 вучань токара на з-дзе «Стары Арсенал», з 1896 токар на Пуцілаўскім з-дзе ў Пецярбурзе. Тут арганізаваў марксісцкі гурток, які ўваходзіў у *Пецярбургскі «Саюз барацьбы за вызваленне рабочага класа»*. Па справе «Саюза барацьбы» ў ліп. 1899 арыштаваны і ў крас. 1900 высланы ў Тыфліс, адкуль за рэвалюц. дзейнасць у сак. 1901 высланы ў Рэвель (Талін). Тут у 1902 стварыў марксісцкі гурток і падпольную друкарню; быў агентам *«Іскры»*. У студз. 1903 зняволены ў пецярбургскую турму «Крыжы», у ліп. зноў высланы ў Рэвель. У пач. 1904 арыштаваны і на 4 гады сасланы ў Алонецкую губ. Нелегальна вярнуўся ў Пецярбург; у кастр. 1905 узначаліў бальшавіцкую арг-цыю Пуцілаўскага з-да. Актыўны ўдзельнік рэвалюцыі 1905—07. Дэлегат IV з'езду РСДРП (1906), падтрымліваў ленінскую лінію. З 1906 чл. Пецярбургскага к-та; у 1911—12 кіраўнік Выбаргскай арг-цыі РСДРП, адзін са стваральнікаў газ. *«Правда»*. На VI (Пражскай) канфер. РСДРП выбраны канд. у чл. ЦК і ўведзены ў склад Рус. бюро ЦК. У 1-ю сусв. вайну прапагандаваў ленінскую тактыку па пытаннях вайны, міру і рэвалюцыі, вёў барацьбу супраць меншавікоў-



абаронцаў. У студз. 1916 арыштаваны па справе Петраградскага к-та РСДРП, прыгавораны да ссылкі ва Усх. Сібір. Уцёк і падпольна вёў парт. работу. У дні Люг. рэв. 1917 адзін з кіраўнікоў барацьбы рабочых і салдатаў Петраграда супраць самадзяржаўя, чл. першага легальнага Петраградскага к-та бальшавікоў і яго прадстаўнік у Бюро ЦК РСДРП(б), чл. рэдакцыі газ. «Правда». Удзельнік падрыхтоўкі і правядзення Кастр. рэвалюцыі. Пасля перамогі Кастрычніка — галава Петраградскай гар. думы. У 1918 камісар гар. гаспадаркі Петраграда. З сак. 1919 Старшыня ВЦВК; в снеж. 1922 Старшыня ЦВК СССР; з студз. 1938 да сак. 1946 Старшыня Прэзідыума Вярх. Савета СССР. Многа ўвагі аддаваў Беларусі і наведаў яе 5 разоў. У чэрв. 1919 К. на чале агіт.-інструктарскага поезда «Кастрычніцкая рэвалюцыя» (гл. *Агітпаязды*) наведаў Віцебск, Оршу, Шклоў, Магілёў, Жлобін, Гомель, Бабруйск, Мінск; быў у в. Бабінічы Віцебскага пав., у Машканскай вол. Аршанскага пав., Палыкавіцкай вол. Магілёўскага пав., Гарбацэвіцкай вол. Бабруйскага пав., Самахвалавіцкай і Сенніцкай вал. і нацыяналізаваным маёнтку Ігнацічы Мінскага пав. Выступленні К. на аб'яднаным пасяджэнні сав., парт. і прафесійных арг-цый, на 87 мітынгах перад рабочымі, сялянамі, чырвонаармейцамі па пытаннях міжнар. становішча і ўнутр. палітыкі Сав. улады мабілізавалі працоўных БССР на дапамогу фронту. 20.6.1919 К. удзельнічаў у рабоце аб'яднанага пасяджэння ЦВК Літвы і Беларусі, Мінскага Савета, праўленняў прафесійных саюзаў, на якім абмяркоўваўся *дэкрэт «Аб аб'яднанні савецкіх рэспублік: Расіі, Украіны, Латвіі, Літвы, Беларусі для барацьбы з сусветным імперыялізмам»*. 2—5.10.1920 К. прымаў удзел у рабоце III Гомельскага губ. з'езду Саветаў, выбраны ганаровым старшынёй з'езду і выступіў з дакладам аб міжнар. і ўнутр. становішчы Сав. Расіі, а таксама на ўрачыстым выпуску губ. парт. школы, на мітынгу рабочых чыг. майстэрняў. У сак. 1924 К. выступаў у Мінску: на *Шостым Усебеларускім з'ездзе Саветаў*, які адбыўся ў сувязі з *узбуйненнем БССР*, 14.3.1924 у Бел. с.-г. ін-це, азнаёміўся з работай прадпрыемстваў і ўстаноў горада. У вер. 1933 К. прыязджаў на Беларусь, каб памагчы парт. і сав. органам у арганіз.-гасп. умацаванні калгасаў; выступаў на 1-м Усебеларускім злёце конюхаў-ударнікаў; азнаёміўся з работай некат. заводаў Мінска. У 1935 К. у Мінску на юбілейнай сесіі ЦВК БССР 11.7.1935 уручыў Беларусі ордэн Леніна. На VIII—XVIII з'ездах ВКП(б) выбраны чл. ЦК; канд. у чл. Палітбюро ЦК (1920—26), чл. Палітбюро ЦК ВКП(б) (1919, 1927—46). Аўтар прац па пытаннях сацыялістыч. буд-ва і камуніст. выхавання. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, 2 ордэнамі Чырв. Сцяга. Яго імем названы г. Калінін (да 1931 Цвер), Калінінград (да 1946 Кёнігсберг) і інш.; прадпрыемствы, калгасы і вуліцы, у т. л. і ў БССР; помнікі ў г. Калініне, Калінінградзе, Таліне, на Гомельскім вагонарамонтным з-дзе і інш. Пахаваны на Краснай плошчы ў Маскве.

Тв.: О коммунистическом воспитании, Мн., 1970; бел. пер.— Што дала Савецкая ўлада працоўным, Мн., 1940; Магутнасць Савецкай дзяржавы, Мн., 1950.

Літ.: Толмачев А. Калинин, М., 1963 (Жизнь замечательных людей); Яцкевіч І., М. І. Калінін у Савецкай Беларусі, Мн., 1970.

В. С. Паваліхіна. Мінск.

КАЛІНІН (да 1931 Цвер), горад, цэнтр Калінінскай вобл. РСФСР. Размешчаны на Волзе, пры ўпадзенні Твярцы. Чыг. вузел і рачны порт. 355 тыс. ж. (1971). Перайменаваны ў гонар М. І. Калініна. Прамысловасць тэкстыльная, маш.-буд., хім., паліграфічная, эл.-энергетычная, харчовая. З-ды: вагонабудаўнічы, экскаватарны, шклопластыкаў і шкловалакна; камбінаты: баваўняны, штучнага валакна, 2 паліграфічныя, штучнай скуры; ф-кі: прадзільна-ткацкая, швейная, шаўкаткацкая. Політэхнічны, мед., пед. ін-ты; 10 сярэдніх спец. навуч. устаноў. 3 тэатры (драм., юнага гледача, лялечны), філармонія. Краязнаўчы музей, карцінная галерэя.

Упершыню ўпамінаецца ў летапісах 12 ст. З 40-х г. 13 ст. цэнтр Цвярскога княства, якое ў 1485 далучана да Маскоўскай дзяржавы. З 1775 цэнтр Цвярской губ. Сав. ўлада ўстаноўлена 28.10 (10.11).1917. У Айч. вайну акупаваны ням.-фаш. захопнікамі (14.10—16.12.1941) і разбураны. Пасля вайны адноўлены. У 1971 узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга.

КАЛІНІН Пётр Захаравіч [12(25).1.1902, в. Альховікі Полацкага пав. Віцебскай губ.— 12.12.1966], парт. і дзярж. дзеяч БССР, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1928. Скончыў Рэсп. школу прапагандыстаў пры ЦК КП(б)Б (1937), Вышэйшую школу парт. арганізатараў пры ЦК ВКП(б) (1941). У 1924—26 у Чырв. Арміі. У 1926—35 на сав. рабоце ў Сіроцінскім р-не. З 1937 на парт. і сав. рабоце ў Чашніцкім р-не. У 1938 у апараце ЦК КП(б)Б; з 1939 нам. наркома земляробства БССР, першы сакратар Вілейскага абкома КП(б)Б. У 1941—44 сакратар ЦК КП(б)Б, чл. Ваен. савета 21-й арміі, нам. нач. штаба партыз. руху пры Ваен. савеце Зах. фронту. З вер. 1942 нач. *Беларускага штаба партызанскага руху*. У 1944—48 першы сакратар Гродзенскага абкома КП(б)Б; у 1948—51 нам. старшыні Савета Міністраў БССР. З 1951 міністр саўгасаў, дарожнай і трансп. гаспадаркі, хлебапрадуктаў БССР. З 1959 саветнік Савета Міністраў БССР. На XVIII, XIX і XXII з'ездах КПБ выбіраўся чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета СССР 2—4-га скл.; Вярх. Савета БССР 1—3, 5-га скл. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, 3 інш. ордэнамі, медалямі, ордэнам ПНР. Імем К. названа школа ў Ляскавічах Шумілінскага р-на, Скідальскі цукр. з-д.



Тв.: Белорусский штаб партизанского движения, у кн.: Непокоренная Белоруссия, М., 1963; Партизанская республика, 2 изд., Мн., 1968.

Э. Ф. Языковіч. Мінск.

КАЛІНІН Сцяпан Мікітавіч (н. 25.11.1923, в. Мардоўская Бокла Бугурусланскага пав. Самарскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1945. На фронце з 1942. Вызначыўся ў Гродзенскай вобл. 14.7.1944 аддзяленне на чале з К. фарсіравала Нёман каля в. Лунна, захапіла плацдарм, адбіла 12 контратак. Паранены К. працягваў камандаваць аддзяленнем. Жыве ў Куйбышаве.

КАЛІНІН Ціхан Ігнатавіч [6(19).8.1916, с. Смышляеўка Сенгілееўскага пав. Сімбірскай губ. — 13.7.1944], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1939. У Чырв. Арміі з 1937, на фронце з 1941, камандзір асобнага знішчальнага процітанкавага дывізіёна. Вызначыўся пры вызваленні Пінска. 13.7.1944 дывізіён на чале з маёрам К. прарваў варожыя ўмацаванні, фарсіраваў з 4 гарматамі р. Ясельду і ўступіў у бой з 5 танкамі. Артылерысты адбілі некалькі контратак ворага і з пяхотай прадоўжылі наступленне. Загінуў у баі.

КАЛІНІНГРАД (да 1946 Кёнігсберг, у бел. і польск. летапісах Кролевец, Крулевец), горад, цэнтр Калінінградскай вобл. РСФСР, на р. Прэголя, за 7 *км* ад упадзення яе ў Калінінградскі зал. Балтыйскага мора. Порт і буйны чыг. вузел. 306 тыс. ж. (1971). Перайменаваны ў гонар М. І. Калініна. Прамысловасць: машынабудаванне і металаапрацоўка (з-ды: вагонабудаўнічы, суднарамонтны, аўтамаб. запчастак, вежавых і партальных кранаў; вытв. абсталявання для рыбаперапрацоўчых і цэлюлозна-папяровых прадпрыемстваў), харчовая (пераважна рыбная, больш за 50% усяго аб'ёму валавой прадукцыі прамысл. К.), цэлюлозна-папяровая. У К. базіруецца кітабойная флатылія «Юрый Далгарукі». *Калінінградскі універсітэт*, тэхн. ін-т рыбнай прамысл. і гасп., Вышэйшае інж. марское вучылішча, 8 сярэдніх спец. навуч. устаноў. Драм. тэатр. Краязнаўчы музей. Бат. сад. Заапарк.

Засн. ў 1255 Тэўтонскім ордэнам на землях балцкага племя прусаў. З 1701 у складзе каралеўства Прусіі, з 1871 — аб'яднанай Германіі; ваен. крэпасць і апора пруска-германскага мілітарызму на У. У Сямігадовую вайну 1756—63 заняты рус. войскамі (студз. 1758), цэнтр рус. ген.-губернатарства Усх. Прусіі (1758—62). 9.4.1945 сав. войскі штурмам узялі К. Паводле рашэння Патсдамскай канферэнцыі 1945 у складзе СССР.

КАЛІНІНГРАДСКАЯ ВОБЛАСЦЬ, у складзе РСФСР. Утворана 7.4.1946 на тэр. часткі былой Усх. Прусіі, перададзенай Сав. Саюзу паводле рашэння Патсдамскай канферэнцыі 1945. Пл. 15,1 тыс. *км*². Нас. 741 тыс. чал. (1971). Падзяляецца на 13 раёнаў; 22 гарады, 5 гар. пасёлкаў. Цэнтр Калінінград.

К. в. займае частку паўд.-ўсх. ўзбярэжжа Балтыйскага мора. На З у мора ўдаецца Калінінградскі п-аў. На ПнУ ад яго адыходзіць Куршская плясчаная каса, якая абмяжоўвае Куршскі заліў; на ПдЗ — Балтыйская каса, абмяжоўвае Віслінскі заліў. Паверхня вобл. раўнінная, з марэннымі грады на З і ПдУ. Найвыш. пункт на У — 231 *м*. На ПнУ і ўзбярэжжы Калінінградскага заліва тэр. месцамі апускаецца ніжэй узр. мора (польдэры). Уздоўж узбярэжжа — палоса пясчаных пляжаў, на косах і часткова на ўзбярэжжы — дзюны. Карысныя выкапні: янтар (80% сусв. запасаў), каменная соль, фасфарыты, торф, нафта, буд. матэрыялы. Клімат пераходны ад марскога да ўмеранага кантынентальнага. Сярэднія т-ры студз. ад −2,5 да −4,5, ліп. ад 16,5 да 17,5 °С. Ападкаў 600—750 *мм* за год. Вегет. перыяд 180—200 дзён. Найб. рэкі Нёман (з прытокам Шэшупе) і Прэголя (з прытокам Лава). Многа азёраў і балотаў. Глебы дзярнова-падзолістыя, балотна-лугавыя і балотныя. Пад лесам 20% тэр. Пашырана елка, хвоя, ліпа, клён, дуб, граб. Асн. насельніцтва рускія. Сярэдняя шчыльнасць 48,5 чал. на 1 *км*². Гарадскога нас. 74%. Найб. гарады: Калінінград, Савецк, Чарняхоўск, Гусеў, Балтыйск.

Асн. галіны прамысловасці: машынабудаванне і металаапрацоўка (Калінінград, Гусеў, Чарняхоўск); цэлюлозна-папяровая (Калінінград, Савецк, Нёман, Знаменск), рыбная і рыбакансервавая (Калінінград, Светлы, Палеск, Мамонава). Машынабудаванне: суднарамонтнае, вытв. цэльнаметалічных самаразгружальных вагонаў, аўтапагрузчыкаў, вежавых і партальных кранаў, абсталявання для цэлюлозна-папяровых, рыбаперапрацоўчых прадпрыемстваў; прылады і аўтаматы для газавай прамысловасці, святлотэхн. арматуры і інш. Рыбная прамысл. (рыбалоўная і рыбаперапрацоўчая) па валавым аб'ёме займае 1-е месца ў вобласці. Прадпр. харчовай прамысл. (мясная, масларобча-сыраварная, мукамольная, лікёра-гарэлачная). Прамысловасць: трыкатажная (Гусеў, Калінінград, Савецк), швейная (Калінінград), галантарэйная (Гвардзейск, Зеленаградск), абутковая (Калінінград), гарбарная і мэблевая (Чарняхоўск), буд. матэрыялаў. Вытворчасць вырабаў з янтару (г. п. Янтарны). У 1971 у вобл. было 65 саўгасаў і 104 калгасы. С. гасп. спецыялізуецца на малочна-мясной жывёлагадоўлі; вырошчваюць бульбу, збожжавыя, агародніну. Агульная пасяўная пл. (тыс. *га*, 1970) 397,8, в іх пад збожжавымі і зернебабовымі 153,3, кармавымі 223,5, бульбай і агародніна 21; са збожжавых союць ячмень (61,3), пшаніцу (32,7), жыта (22,6). На пач. 1971 (тыс. галоў) было: буйн. раг. жывёлы 390,4, у т. л. кароў 158,0; свіней 221,7, авечак і коз 78,0, птушак 1551. Агульнасаюзнае значэнне ў К. в. маюць марскі транспарт (Калінінградскі порт). Даўж. чыгунак (1970) 756 *км*. Найб. чыг. вузлы: Калінінград і Чарняхоўск. Аўтамаб. дарог з цвёрдым пакрыццём 10 629 *км* (1969). Суднаходства на Нёмане і Прэголі. У вобл. *Калінінградскі універсітэт*, тэхн. ін-т рыбнай прамысл. і гасп., Вышэйшае інж. марское вучылішча; 13 сярэдніх спец. навуч. устаноў. 2 драматычныя тэатры, краязнаўчы музей. Абласная газета «Калининградская правда».



Літ.: Калининградская область. Очерки природы, Калининград, 1969.

А. А. Якубоўскі. Гусеў Калінінградскай вобл.

КАЛІНІНГРАДСКІ УНІВЕРСІТЭТ, вышэйшая навучальная ўстанова. Засн. ў 1967 на базе Калінінградскага пед. ін-та (з 1948). Ф-ты ў 1970/71 навуч. г.: гісторыка-філал., фізіка-матэм., прыродаазнаўчых навук, эканоміка-прававы. Навучанне дзённае, вячэрняе і завочнае. Есць аспірантура. У складзе ун-та заалагічны музей, бат. сад, фундаментальная б-ка. Выдае «Вучоныя запіскі» (з 1967).

КАЛІНІНСК (да 1924 хутар Цясна), вёска ў Лашанскім с/с Уздзенскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса «Камунар». За 7 *км* на У ад Узды, 81 *км* ад Мінска, 28 *км* ад чыг. ст. Негарэлае, на аўтамаб. дарозе Негарэлае — в. Валяр'яны. 130 ж., двароў 39 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання, сепаратарны пункт. Васьмігадовая школа, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

КАЛІНІНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ, у складзе РСФСР. Утворана 29.1.1935. Размешчана ў цэнтры Еўрап. часткі СССР, у вярхоўях Волгі. Пл. 84,1 тыс. *км*². Нас. 1710 тыс. чал. (1971). Падзяляецца на 33 раёны, 22 гарады, 25 гар. пас. Цэнтр г. Калінін.

Паверхня К. в.— раўніна з чаргаваннем узгорыстых узвышшаў і зандравых нізінаў. На З вобл. Валдайскае узв. з выш. да 343 *м*. На ПдУ — Прыволжская нізіна. Карысныя выкапні: буры вугаль (Нялідава), торф, гліны, кварцавыя пяскі, вапнякі, даламіты, мінер. фарбы (Вышні Валачок). Есць мінер. крыніцы (калля Кашына). Клімат умеранага кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. −8, −12, ліп. 18 °С. Ападкаў 520—630 *мм* за год. Вегет. перыяд 130—140 дзён. Найб. рака Волга з прытокамі Селіжараўка, Цьма, Твярца, Мядаведзіца, Малога, Нерль і інш. Многа азёраў (больш за 600), асабліва на ПнЗ. Самае вялікае Селігер. Вадасх. Волжскае. Рыбінскае і Вышневалоцкае. Глебы падзолістыя, дзярнова-падзолістыя, балотныя, у далінах рэк алювіяльныя. Пад лесам і хмызняком каля 40% тэр., пераважна на ПнЗ. У вытоках Волгі і Зах. Дзвіны Цэнтральналясны запаведнік. Насельніцтва ў асноўным рускае. Жывуць таксама карэлы. Сярэдняя шчыльн. 20,4 чал. на 1 *км*². Гарадскога насельніцтва 58%. Найб. гарады: Калінін, Вышні Валачок, Балагое, Ржэў, Таржок, Кімры.



Асн. галіны прамысловасці: энергетычная, лёгкая і машынабудаванне. Канакоўская ЦЭС (2,4 млн. *квт*), камбінаты баваўняны і штучнага валакна, трыкатажная і шаўкаткацкая ф-кі ў Калініне, баваўняны камбінат, прадзільная і прадзільна-ткацкая ф-кі ў Вышнім Валачку. Вытв. тонкага сукна (Казлова), першасная перапрацоўка лёну (ільночасальная ф-ка ў Ржэве, прадпрыемствы ў Кашыне, Бежацку). У Куўшынаве цэлюлозна-папяровы камбінат. Прадпрыемствы гарбарна-абутковай (Калінін, Асташкаў, Таржок, Калязін, Кімры), мэблевай, сілікатна-керамічнай (Вышні Валачок, Фірава, фаянсавы з-д у Канакове), дрэваапр. (лесапільні ў Максацісе, Вышнім Валачку), буд. матэрыялаў, паліўнай, харч. (у т. л. малочна-мясной, мясной, сыраварнай, спірта-гарэлачнай) прамысловасці. Машынабудаванне: вагонабуд., вытв. экскаватараў, тарфяных машын, матавозаў (Калінін), с.-г. машын (Бежацк), прылад і абсталявання для камунальнай гаспадаркі (Ліхаслаўль). С. гасп. льно-жывёлагадоўчага кірунку. У К. в. 442 калгасы і 240 саўгасаў (1.1.1971). Пасяўная пл. ў 1971 (тыс. *га*) 1511,5, з іх пад збожжавымі 709,4 (у т. л. пад жытам і аўсом 605,1), кармавымі 506, агароднінай і бульбай 137,2. Асн. тэхн. культура лён (159,2 тыс. *га*). Жывёлагадоўля малочна-мяснога кірунку. На пач. 1971 (тыс. галоў) буйн. раг. жывёлы 946,3 (у т. л. кароў 467,5), свіней 421,3, авечак і коз 725,3. Даўж. чыгунак 2198 *км*, аўтамаб. дарог

9,7 тыс. км, у т. л. з цвёрдым пакрыццём 5,4 тыс. км (1971). Суднаходства па Волзе ад Каліпіна. Політэхн., мед. і пед. ін-ты, 38 сярэдніх спец. навуч. устаноў. 5 тэатраў, 11 музеяў. Абл. газета «Калининская правда».

Літ.: География Калининской области. М., 1965.
Г. В. Анічэнка. Мінск.

КАЛІНІЧ Мікалай Дзянісавіч (н. 1909, Харкаўская губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). На фронце з 1941. Вызначыўся ў Камарынскім р-не Палескай вобл. 28.9.1943 група воінаў на чале з К. фарсіравала Дняпро, выбіла ворага з умацаванняў, захапіла плацдарм і стварыла ўмовы для пераправы астатніх падраздзяленняў палка.

КАЛІНКАВІЦКАЕ КАМСАМОЛЬСКАЕ ПАДПОЛЛЕ ў гады Вялікай Айчыннай вайны, камсамольска-маладзёжная антыфаш. арг-цыя, якая дзейнічала ў г. п. Калінкавічы Палескай вобл. ў перыяд ням.-фаш. акупацыі з вер. 1941 да кастр. 1943. Яе дзейнасць накіроўвалі Калінкавіцкі падпольны гарком КП(б)Б (сакратар В. І. Баравік, жн.— кастр. 1943, чл. К. К. Пінкевіч, Я. І. Шыла), Калінкавіцкае камуніст. падполле [кіраўнікі П. С. Ануфрыеў (з мая 1942), В. І. Баравік (вер. 1941 — жн. 1943), І. В. Змушко, Н. Я. Кісялюк, В. К. Палякоў, Н. К. Ергулевіч]. З вер. 1941 дзейнічала камсамольска-маладзёжная арг-цыя пад назвай «Смугнар» («Смерць прыгнятальнікам народа») на чале з камсамольцам К. Ярмілавым. Яе чл. С. Шаўчэнка, П. Яроменка, Мікалай Змушко, В. Таларая, І. Корбаль, М. Ткач, В. Сякач, В. Такарскі, Л. Лабанаў і інш. друкавалі і распаўсюджвалі зводкі Саўінфармбюро, лістоўкі, збіралі зброю, знішчалі ням.-фаш. акупантаў і іх паслугачоў, вялі работу па разлажэнні варожых фарміраванняў. У пач. 1942 яны наладзілі сувязь з камандай польскіх чыгунчнікаў. Група палякаў-антыфашыстаў (11 чал.) на чале з Я. Зробакам праз падпольшчыкаў перадавала партызанам тол, патроны, медыкаменты, паперу для друкавання лістовак і інш. У чэрв. 1942 калінкавіцкія падпольшчыкі (9 чал.) і некалькі палякаў правялі ўзбр. рэйд па вёсках Палесся, у ходзе якога знішчалі пункты збору харч. прадуктаў для ворага, разгромілі некалькі паліцэйскіх участкаў, забралі зброю і боепрыпасы ў даманавіцкай камендатуры. Падпольшчык М. Паўлаў спаліў пяньковы з-д на ст. Гарочычы. У ноч на 29.6. 1942 падпольшчыкі Ярмілаў і Шаўчэнка з дапамогай групы Зробака замініравалі і падпалілі мост-пуцепровод на калінкавіцкім чыг. вузле. Калі салдаты спыненага эшалона з варожай пяхотай кінуліся тушыць мост, ён узарваўся. Пачалася перастрэлка паміж салдатамі эшалона і мясцовага гарнізона, у выніку чаго забіта і паранена каля 100 варожых салдатаў і афіцэраў. Пасля гібелі групы К. Ярмілава ў вер. 1942 К. к. п. ўзначаліў М. Судас. Падпольшчыкі М. Манько, В. Жамойдзік, У. Дарашкавец, А. Драбніца, І. Драбніца, В. Драбніца, В. Карнявец, В. Церашкавец, А. Мужэнка і інш. вялі агіт. работу сярод насельніцтва, распаўсюджвалі лістоўкі, зводкі Саўінфармбюро, знішчалі фаш. агентуру, перапраўлялі ў партызаны ваеннапалонных. Дарашкавец і Судас, якія працавалі на чыгунцы, расшывалі чыг. палатно, учынялі крушэнні. 2.5.1943 фашысты арыштавалі некалькіх падпольшчыкаў. Калі ў вер. 1943 эпоў навісла пагроза арышту, паводле рашэння партыз. камандавання падпольшчыкі пайшлі ў партызаны. У барацьбе з ням.-фаш. захопнікамі загінулі К. Ф. і Ф. М. Ярмілавы, С. Шаўчэнка, П. Яроменка, В. Таларая, Мікалай Змушко, І. Корбаль, В. Сякач, М. Ткач, Дз. Уладыкоўскі, В. Церашкавец і інш. Многія члены К. к. п. ўзнаг. ордэнамі і медалямі СССР. У Калінкавічах на будынку школы № 4, на будынках, дзе размяшчаліся арг-цыя Ануфрыева, падпольны гарком КП(б)Б,— мемар. дошкі.

Літ.: В едином строю. Мн., 1970; Нам не забыть вас, ребята!, М., 1970; Ветров И. Д. Братья по оружию, Мн., 1965.
І. Дз. Вятроў. Мінск.

КАЛІНКАВІЦКІ РАЁН, у складзе Гомельскай вобл. Утвораны 3.7.1939. Размешчаны ў цэнтр. частцы вобл. Пл. 2,8 тыс. км². Нас. 86,4 тыс. чал. (1971, з Калінкавічамі). Падзяляецца на 22 сельсаветы; г. п. Азарычы. Цэнтр г. Калінкавічы.

Раён размешчаны ў межах Гомельскага Палесся, на З заходзіць Прыпяцкае Палессе. Выш. да 150 м над узр. м. На крайнім ПдУ Юравіцкае ўзв. (выш. да 168 м). З карысных выкапняў — Сухавіцкае радовішча торфу з агульнымі запасамі 5,5 млн. т. Сярэдняя т-ра студз. —6,2, ліп. 18,8 °С. Ападкаў 575 мм за год. Вегет. перыяд 197 дзён. Рака Прыпяць з прытокамі Трэмля, Іпа, Ненач, Закованка, Віць. Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (22,4%), дзярнова-падзолістыя, знізу аглееныя (18,0%), дзярнова-падзолістыя забалачальныя (12,6%), дзярновыя забалачальныя (7,3%), тарфяна-балотныя (31,9%), алювіяльныя (7,8%). З мінер. глебаў 76,4% пясчаных, 19,8 супясчаных, 3,8% суглінкавых. Якасная ацэнка глебаў у балах: ворных зямель — 42 (цана бала 0,23 ц/га збожжа), кармавых угоддзяў — 34, усіх с.-г. угоддзяў — 38. Пад лесам 48% тэр.

Збор яблыкаў у калгасе імя Леніна.



Пераважаюць шыракаліста-хваёвыя лясы з прымессю асіны, бярозы, вольхі. Насяляюць раён беларусы, ёсць рускія, украінцы і інш. Сярэдняя шчыльнасць 30,8 чал. на 1 км². Гарадскога нас. 31,2%. Прамысловасць харчовая, лёгкая, буд. матэрыялаў, металаапрацоўчая. Найб. прадпрыемствы: мясакамбінат, хлебазавод, млынкамбінат, плодакансервавы камбінат (Калінкавічы), пякарня (Азарычы), Даманавіцкі агародніна-сушыльны з-д; пянькоўны з-д у Гарочычах, мэблевая ф-ка, камбінат быт. абслугоўвання, ф-ка быт. хіміі, прамкамбінат, з-д і палігон жалезабетонных вырабаў, цэх Мазырскага домабудаўнічага камбіната, з-д дахавых матэрыялаў, рамонтна-механічны з-д, лакаматыўнае дэпо, раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі і Палескае спецыялізаванае адда. Сельгастэхнікі, лясгас і Палескі хімлясгас (Калінкавічы). У раёне 21 калгас, 8 саўгасаў, доследная с.-г. станцыя (1971).



Саўгасы і іх цэнтры: «Азарычы» (*Азарычы*), «Беразінскі» (*Крукавічы*), «Галявічы» (*Аляксандраўка*), «Дудзічы» (*Дудзічы*), «Калінкавіцкі» (*Гарочычы*), «Каплічы» (*Каплічы*), «Ненач» (*Шычы*), «Трамлянскі» (*Савічы*). Палеская доследная с.-г. станцыя Беларускага НДІ земляробства (*Ліпава*).

С. гасп. спецыялізуецца на мяса-малочнай жывёлагадоўлі, гадоўлі свіней; вырошчваюць бульбу, збожжавыя культуры. Пад с.-г. ўгоддзямі 40% тэр. На пач. 1971 асушана 65 тыс. га забалочаных зямель (у т. л. 34 тыс. га тарфянікаў). Агульная пасяўная пл. (тыс. га, 1970) 63,2, у т. л. пад збожжавымі і зернебабовымі (жыта, пшаніца, ячмень, авёс, грэчка і інш.) 25,2, тэхн. 1,0, бульбай 10,4, кармавымі культурамі 26,2. На пач. 1971 (тыс. галоў) буйн. раг. жывёлы 61,3, у т. л. кароў 29,5; свіней 37,8, авечак і коз 7,2. Па тэр. раёна праходзяць чыгункі Брэст — Гомель і Магілёў — Оўруч; аўтамаб. дарогі Бабруйск — Калінкавічы — Оўруч, Гомель — Жыткавічы і інш. У 1971 у раёне (без Калінкавіч) было 20 сярэдніх, 33 васьмігадовыя, 46 пач. школ, 2 спец. школы-інтэрнаты, 8 дашкольных устаноў, 60 клубных устаноў, 53 кінаўстаноўкі (у т. л. 35 стацыянарных), 64 масавыя б-кі, 9 бальніц, 39 фельч.-ак. пунктаў; працаваў 851 спецыяліст з вышэйшай адукацыяй, у т. л. 33 інжынеры, 70 аграномаў, 20 эканамістаў, 30 заатэхнікаў, 30 вет. урачоў, 478 настаўнікаў, 78 урачоў і інш.; 1238 чал.

Свінаферма ў саўгасе «Галявічы».



з сярэдняй спец. адукацыяй. Раённая газ. «За камунізм». *С. В. Курач.* Мінск.

КАЛІНКАВІЧЫ, горад абласнога падпарадкавання, цэнтр Калінкавіцкага р-на Гомельскай вобл. Вузел чыг. ліній Магілёў — Оўруч і Гомель — Брэст. 25,1 тыс. ж. (1971). Прамысловыя прадпрыемствы: мясакамбінат, хлебазавод, ф-кі мэблевая і быт. хіміі. Пялескі хімлясгас, камбінат быт. абслугоўвання, прамкамбінат, рамонтна-мех. з-д, раённае аб'яднанне і Палескае спецыяліз. аддз. Сельгастэхнікі, з-д і палігон жалезабетонных вырабаў, цэх Мазырскага домабудаўнічага камбіната, з-д дахавых матэрыялаў. 6 сярэдніх школ, 1 завочная, 2 школы рабочай моладзі, муз. і спарт. школы, 13 дашкольных устаноў, Дом піянераў, Дом культуры, кінатэатр, 4 масавыя б-кі, 3 бальніцы. 2 брацкія магілы 732 сав. воінаў і партызанаў, якія загінулі пры вызваленні К. ад ням.-фаш. захопнікаў. Мемарыяльныя дошкі на ўшанаванне памяці падпольнай камсамольска-маладзёжнай арг-цыі «Смугнар» («Смерць прыгнятальнікам народа»), якая дзейнічала ў Вял. Айч. вайну. 3 помнікі У. І. Леніну.

Вядомы з 18 ст. Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793) у складзе Мінскай губ., належаў кн. Шахоўскаму, з 1805 царскай казне. Рост К. звязаны з буд-вам Палескай чыгункі. З 1882 станцыя, у 1907—10 чыг. вузел на лініі Жлобін — Корасцень. У крас. 1917 тут узнік Савет рабочых дэпутатаў. Сав. ўлада ўстаноўлена ў кастр. 1917. Для барацьбы з польскімі інтэрвентамі і контррэвалюцыяй у ліст. 1919 сфарміраваны Калінкавіцкі камуніст. атрад. У баях з бандамі Булак-Балаховіча калля К. у ліст. 1920 загінуў камбрыг В. Дз. *Кайшоў.* К.— горад з 1926. З 21.8.1941 да 14.1.1944 акупаваны ням.-фаш. захопнікамі, якія загубілі 455 мірных жыхароў. У Айч. вайну ў К. дзейнічаў падпольны гарком КП(б)Б. *Калінкавіцкае камсамольскае падполле.* *М. З. Агееў.* Гомель.

КАЛІНКІН Міхаіл Герасімавіч (1916, Петраград — 22.11.1943), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1940. На фронце з 1941. Вызначыўся ў Кармянскім р-не Гомельскай вобл. 22.11.1943 рота на чале з капітанам К. уварвалася ў траншэі і выбіла з іх ворага. Каб прыпыніць кулямётны агонь з варожага дзота, паранены К. закрыў амбразуру сваім целам. Натхнёныя яго ўчынкам байцы захапілі важны плацдарм за р. Сож і вызвалілі в. Студзянец.

Калінкавічы. Плошча імя Леніна.



КАЛІНКОЎСКІ Сцяпан Антонавіч (1918, в. Даколь Бабруйскага пав. Мінскай губ.—1945), Герой Сав. Саюза (1945). З сялян. Чл. КПСС. У Чырв. Арміі з 1939. У Айч. вайну на Паўн.-Зах., 1-м Укр. і 1-м Бел. франтах—механік-вадзіцель танка. Вызначыўся ў Польшчы. У час наступлення зімой 1945 правёў танк без аварый больш за 300 *км*, знішчыў 2 варожыя мінамётныя батарэі, 120 павозак і 11 аўтамашын з боепрыпасамі. 23.1.1945 захапіў і ўтрымліваў да падыходу падмацавання пераправу цераз р. Нотаць. 26.1.1945 адзін з першых уварваўся на тэр. Германіі. Загінуў у баі. Навечна залічаны ў спісы вайск. часці.



КАЛІННІКАЎ Васіль Сяргеевіч [1(13).1.1866, с. Воін Мцэнскага пав. Арлоўскай губ. — 29.12.1900(11.1.1901)], рускі кампазітар. Скончыў муз.-драм. вучылішча Філарманічнага т-ва ў Маскве (1892). Хворы на сухоты, жыў пераважна ў Ялце. Амаль усе творы (2 сімфоніі, сімф. карціна «Кедр і Пальма», пралог да оперы «У 1812 годзе», музыка да трагедыі А. К. Талстога «Цар Барыс») прыпадаюць на перыяд 1895—1900. Сусв. папулярнасць набыла ліра-эпічная 1-я сімфонія (1895), яркая нацыянальная, меладычная.

Літ.: Василий Калинников. Письма, документы, материалы, т. 1—2, М., 1959; Пасхалов В. Василий Сергеевич Калинников, Л.— М., 1951.

КАЛІНОЎСКАЯ (да 1969 Ліхасельцы), вёска ў Нязбодзіцкім с/с Свіслацкага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса імя Кастуся Каліноўскага. За 8 *км* на ПдЗ ад Свіслачы, 96 *км* ад Гродна, 6 *км* ад чыг. ст. Свіслач, на аўтамаб. дарозе г. п. Свіслач — в. Дабраволя. 293 ж., двароў 93 (1971). Васьмігадовая школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. Ням.-фаш. захопнікі часткова спалілі вёску, расстралялі 26 жыхароў.

КАЛІНОЎСКІ Валяр'ян Валяр'янавіч [3(15).2.1896, Астрахань — 23.10.1941], беларускі савецкі спявак (барытон). Засл. арт. БССР (1940). Вучыўся ў А. Баначыча ў Саратаўскай кансерваторыі (1926—28), Бел. муз. тэхнікуме (скончыў у 1930), Бел. студыі оперы і балета (1930—33). У 1933—41 саліст Бел. т-ра оперы і балета. Выканаў партыі Змітрака («Міхась Падгорны» Я. Цікоцкага), пана Длугошыца («У пушчах Палесся» А. Багатырова), князя Ігара («Князь Ігар» А. Барадзіна), Анегіна, Томскага («Яўген Анегін» і «Пікавая дама» П. Чайкоўскага), Эскамільо («Кармэн» Ж. Бізэ).

КАЛІНОЎСКІ Віктар Отан Сямёнавіч [9(21).4.1833, в. Мастаўляны Гродзенскага пав.— 25.10(6.11).1862], удзельнік рэвалюц. руху 60-х г. 19 ст., старэйшы брат К. *Каліноўскага.* Скончыў Гродзенскую гімназію (1852). Вучыўся на мед. ф-це Маскоўскага ун-та. З 1856 у Пецярбурзе. Па заданні Віленскай археал. камісіі вывучаў старадаўнія рукапісы па гісторыі Літвы і Беларусі. У 1858—62 адзін з кіраўнікоў польскай рэвалюц. арг-цыі ў Пецярбурзе, слябар З. Серакоўскага, займаўся вярбоўкай новых членаў, забеспячэннем арг-цыі эмігранцкай літаратурай, наладжваў сувязі з канспіратыўнымі арг-цыямі на Украіне. Меў уплыў на свайго брата Кастуся. Памёр ад сухотаў у фальварку Якушоўка Ваўкавыскага пав.

Літ.: Кісялёў Г. Новае пра Кастуся Каліноўскага, «Полымя», 1959, № 7; яго ж. Старонкі вялікага жыцця, там жа, 1963, № 1.

Г. В. Кісялёў. Вільнюс.

КАЛІНОЎСКІ Канстанцін Браніслававіч (13.10.1897, Смаленск — 12.7.1931), удзельнік грамадз. вайны на Беларусі, узнаг. 2 ордэнамі Чырв. Сцяга. З сям'і афіцэра. Чл. КПСС з 1920. Скончыў Ваен. акадэмію РСЧА (1925). Удзельнік 1-й сусв. вайны. З 1918 у Чырв. Арміі на Паўн. фронце. З ліст. 1919 на Зах. фронце камандзір браняпоезда. Вызначыўся ў час прарыву фронту ў р-не ст. Зябкі чыг. Полацк — Маладзечна і пры абароне пераправы цераз р. Ясельду. Удзельнічаў у барацьбе з бандытызмам на Беларусі і Паўн. Каўказе. З 1925 ваен. саветнік рэвалюц. войск у Кітаі, інспектар браняных сіл РСЧА. Загінуў пры выкананні службовых абавязкаў.

КАЛІНОЎСКІ Кастусь [Канстанцін Вікенцій Сямёнавіч; 21.1(2.2).1838, маёнтак Мастаўляны Гродзенскага пав.— 10(22).3.1864], беларускі рэвалюцыянер-дэмакрат і мысліцель, кіраўнік *паўстання 1863—64* на Беларусі і ў Літве. Паходзіў з сям'і дробнамаяткового дваранін-на. У 1855 скончыў Свіслацкае вучылішча. Пасля дадатковай падрыхтоўкі ў 1855 залічаны студэнтам юрыд. ф-та Маск. ун-та. У 1856 паступіў у Пецярбургскі ун-т на камеральны ф-т, які скончыў у 1860, атрымаўшы ступень кандыдата права. У Пецярбурзе пазнаёміўся з рэвалюц. публіцыстыкай «Колокола» і «Современника», з працамі В. Р. Бялінскага, А. І. Герцэна, М. Г. Чарнышэўскага, М. А. Дабралюбава, стаў паслядоўнікам іх ідэй. З гэтага часу актыўна ўдзельнічаў у студэнцкім руху, быў чл. рэвалюц. гуртка З. Серакоўскага (далучаўся да яго левага крыла). У Пецярбурзе пад уплывам сац.-эканам. жыцця і ідэй рэвалюц. дэмакратызму погляды К. набылі яскрава выяўлены антыпрыгонніцкі характар. На пач. 1861 вярнуўся на Беларусь, спрабаваў паступіць на службу,



але як «неблаганадзейнаму» яму адмовілі. З В. Урублеўскім у Гродне стварыў з разначынцаў інтэлігенцыі нелегальную рэвалюц.-дэмакр. арг-цыю, якая наладзіла сувязь з рэвалюц. арг-цыямі ў Вільні. К. і яго прыхільнікі вялі агітацыю сярод сялян па вёсках і мястэчках Гродзеншчыны, заклікалі іх на барацьбу з памешчыкамі і самаўладствам. Рыхтуючы паўстанне 1863 на Беларусі і ў Літве, К. падтрымліваў цесныя сувязі з рэвалюц. Пецярбургам і Масквою, адкуль паўстанцам перапраўлялася зброя. Разам з Урублеўскім і Ф. Ражанскім у 1862 — пач. 1863 выдаваў бел. нелегальную рэвалюц.-дэмакр. газ. *«Мужыцкая праўда».* Выйшла сем нумароў, аўтарам і рэдактарам большасці з іх быў К. «Мужыцкая праўда» ўпершыню на бел. мове несла рэвалюц.-дэмакр. ідэі ў асяроддзе сялянства, заклікала яго да паўстання. У 1862 у камітэце па падрыхтоўцы паўстання, створаным у Вільні, К. ўзначаліў рэвалюц.-дэмакр. крыло. У к-це ішла барацьба паміж рэвалюц.-дэмакр. і ліберальна-дваранскім кірункамі. Кожны бок па-рознаму разумеў задачы паўстання. Ліберальна-дваранскія дзеячы гал. задачай лічылі аднаўленне незалежнай Польшчы ў межах 1772 шляхам умяшання іншаземных дзяржаў, якія прымусяць царскую Расію задаволіць гэтыя патрабаванні. Імкнучыся выкарыстаць для гэтага паўстанне, яны разам з тым баяліся, каб яно не стала масавым, антыпрыгонніцкім. Рэвалюц. дэмакраты на чале з К. патрабавалі скінуць памешчыкаў і самаўладства, устанавіць новыя дэмакр. парадкі, калі ўся зямля будзе належаць сялянам, не будзе саслоўнай і маёмаснай няроўнасці, усе справы дзяржавы будзе вырашаць сам прац. народ. Дзякуючы намаганням К. і яго прыхільнікаў лібералы пацярпелі паражэнне. У жн. 1862 к-т абнавіўся, а яго дзейнасць набыла рэвалюц.-дэмакр. кірунак. У час паўстання 1863 ліберальі часова ўзялі верх у к-це. К. пакінуў к-т і выехаў камісарам Гродзенскай губ. У чэрв. 1863 зноў вярнуўся да кіраўніцтва ў Віленскі к-т, потым стаў на чале ўсяго паўстання. Царызм задушыў паўстанне. 28.1(9.2).1864 К. арыштаваны. На следстве і судзе трымаўся стойка і мужна. Царскія каты патрабавалі, каб ён выдаў сваіх паплечнікаў. К. ім адказваў: «Калі грамадская шчырасць з'яўляецца дабрачыннасцю, то шпіёнства апаганьвае чалавека... Усведамленне гонару, уласнай годнасці і таго становішча, якое я займаў у грамадстве, не дазваляюць мне ісці па іншым шляху». К. гераічна загінуў на царскай шыбеніцы ў Вільні. Характэрная рыса светапогляду К.— пяшавісць да прыгонніцтва, барацьбе з якім ён прысвяціў усё сваё жыццё. К. рэзка крытыкаваў рэформу 1861 як чарговае ашуканства з боку самаўладства і памешчыкаў. Выкрываў арганічнае адзінства мэт цара, яго ўрада, памешчыкаў, чыноўнікаў і вышэйшых духоўных асоб. Сцвярджаў, што ад іх сяляне не могуць атрымаць ні зямлі, ні волі, што гэта справа саміх сялян. К. паказваў, што рэформа 1861 — не міласць цара, а вынік росту сялян-

скага руху ў Расіі. Яна прынесла сялянам новы цяжар — выкупы за зямлю, падаткі, рэкруцтва. К.— палымяны абаронца свабоды, адукацыі і нар. самакіравання. Радаваўся росту самасвядомасці народа, таму, што людзі з сялян самі могуць пісаць і вучыць народ праўдзе і свабодзе. Шкадаваў, што ў школах не даюць асн. ведаў навукі, не вучаць дзяцей на роднай мове. Царскія суды называў воўчай ямай, дзе не разбіраюцца, хто правы, хто вінаваты. Пры царызме няма гарантыі правоў асобы. Народу патрэбен такі ўрад, які б клапаціўся пра народ, даў бы яму самакіраванне, не дапускаў яго прыгнечання, устанавіў гарантыю правоў асобы, стварыў школы. К. прапагандаваў ідэю дэмакр. рэспублікі. Паколькі на парадку дня стаялі задачы бурж.-дэмакр. пераўтварэння, барацьба К. за новы лад аб'ектыўна мела бурж.-дэмакр. характар. Ён абараняў правы бел. народа на нац. свабоду і развіццё нац. культуры. Змагаўся за перамогу нар. рэвалюцыі і верыў, што яна прынясе народу шчасце. Марыў пра такі час, «каб ніколі ніякай нікому мужыкі паншчыны не служылі і ніякага ў казну аброку не плацілі, і каб на век вякоў народ наш быў вольны і шчаслівы» («Мужыцкая праўда», № 2). Як атэіст крытыкаваў догмат пратое, што бог стварыў людзей і даў ім адпаведную душу. Мужыцкую праўду ён ставіў вышэй за бога. Не малітвамі, не верай у бога, а шляхам рэвалюцыі заклікаў ён змяніць тагачасны свет: «...няма чаго ждаць ад нікога, бо той толькі жне, хто пасее. Так сейце ж, дзецюкі, як прыйдзе пара, поўнаю рукою, не шкадуйце працы — каб і мужык быў чалавекам вольным...» («Мужыцкая праўда», № 3). К. разумеў, што грамадскае жыццё не стаіць на адным месцы, яно заканамерна развіваецца, прагрэсіруе. Асновай грамадскага развіцця лічыў асвету, навуку. Аднак пайшоў далей асветніцтва і не рабіў вываду, што сац. зло можна зніштожыць толькі распаўсюджваннем у народзе асветы. Выказваў здагадкі, што без змены матэрыяльнага жыцця людзей немагчымы змены грамадскага і дзярж. ладу. Усе спадзяванні ў рэвалюц. барацьбе ўскладаў на нар. масы. Імкнуўся як мага больш далучыць іх да рэвалюц. руху. Асн. класамі грамадства лічыў сялян і памешчыкаў. Прызнаваў класавасць ідэалогіі. Заклікаў скінуць самаўладства і замяніць яго дэмакр. рэспублікаю. Ідэалізаваў ролю бурж.-дэмакр. дзяржавы. Прызнаваў самавызначэнне нацый, падзяляў тэорыю федэралізму А. І. Герцэна. Адзначаў, што народы Літвы, Беларусі, Украіны самі павінны вырашыць пытанне пра сваю незалежнасць. Рускі і бел. народы лічыў братнімі. К. пісаў: «...Я не праціўнік шчасця народнага, не праціўнік і Расіі, калі яна дабра нам жадае, але праціўнік тых бедстваў, якія пасягаюць край наш няшчасны». Як сялянскі рэвалюцыянер не змог зразумець абмежаванага характару сялянскага руху. Не разумеў, што перадача сялянам усёй зямлі — прагрэс., але не канчатковая мера ў іх вызваленні. Часам ідэалізаваў мінулае феад. Польшчы. Змагаючыся за свабоду сумлення, памылкова атаясамліваў праваслаўе з самаўладствам, аддаваў перавагу уніяцтву перад праваслаўем, не разумеючы, што уніяцкая царква пракладвала шляхі да акаталічвання і апалячвання беларусаў. Нягледзячы на гэта, К. быў і астаўся палымяным рэвалюцыянерам, барацьбітом за справу працоўных. Зрабіў вял. ўплыў на далейшае развіццё перадавой грамадскай думкі на Беларусі, бел. л-ры. Публіцыстыка К.— яркая старонка бел. рэвалюц.-дэмакр. друку і л-ры 19 ст.

Літ.: Лушчыцкі І. М. Нарысы па гісторыі грамадска-палітычнай і філасофскай думкі ў Беларусі ў другой палавіне XIX веку, Мн., 1958, с. 171—255; Рэвалюцыйны пад'ём у Літве і Беларусі 1861—1862 гг., М., 1964 (Восстание 1863 г. Материалы и документы); Паўстанне ў Літве і Беларусі 1863—1864 гг., М., 1965 (Восстание 1863 г. Материалы и документы); Смирнов А. Ф. Кастусь Калиновский, Мн., 1963; Кісялёў Г. В. Сейбіты вечнага, Мн., 1963, с. 5—121; яго ж. Летапіс жыцця і дзейнасці Кастуся Каліноўскага, у кн.: З думай пра Беларусь, Мн., 1966; Александровіч С. Х. Пуцявіны роднага слова, Мн., 1971, с. 25—37; Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры, т. 2, Мн., 1969.

І. М. Лушчыцкі. Мінск.

КАЛІНОЎСКІ Юзаф (Іосіф) Андрэевіч (1.9.1835, Вільня — 15.11.1907), удзельнік паўстання 1863 у Літве і на Беларусі, інжынер-капітан. Скончыў Пецярбургскую інж. акадэмію (1856). Працаваў ў Пецярбурзе, падтрымліваў сувязі з польскай рэвалюц. арг-цыяй, з 1860 у Брэсце. З чэрв. 1863 на чале ваен. секцыі ў Віленскім паўстанцкім цэнтры, найбліжэйшы памочнік К. Каліноўскага па кіраўніцтве паўстаннем на Беларусі і ў Літве, але радыкальных поглядаў яго не падзяляў і быў карысны як ваен. спецыяліст. Арыштаваны ў сак. 1864 і прыгавораны да 10 гадоў катаргі. З 1877 манах-кармеліт.

Тв.: Wspomnienia. 1835—1877, Lublin, 1965.

Літ.: Паўстанне ў Літве і Беларусі 1863—1864 гг., М., 1965 (Восстание 1863 г. Материалы и документы).

Г. В. Кісялёў. Вільнюс.

КАЛІТ (грэч. kólon абадочная кішка), запаленне тоўстай кішкі ад інфекцый (бацылярная дызентэрыя, брушны тыф, паратыфы), інвазій (амёбная дызентэрыя, балантыдыяз і інш.), гельмінтозаў (трыхацэфалёз, аскарыдоз і інш.), небактэрыяльных атручэнняў, парушэнняў харчавання (занадта вострая яда, нястача вітамінаў), хвароб страўніка, печані.

Лячэнне: дыэта, вітаміны, антыбіётыкі, сульфаніламіды, процітліскія прэпараты, пры хранічным К.— курортатэрапія (Есентукі, Жалезнаводск). Прафілактыка: папярэджванне кішачных інфекцый, захаванне рэжыму харчавання.

Літ.: Гукасян А. Г. Болезни кишечника, М., 1964 (бібліягр.).

А. А. Ключароў. Мінск.

КАЛІТОЎСКІ Яўген Фёдаравіч [н. 7(19).6.1896, в. Уселюб Навагрудскага пав. Мінскай губ.], беларускі савецкі вучоны ў галіне фізіятэрапіі і курарталогіі. Канд. мед. н. (1946). Чл. КПСС з 1945. Скончыў Ленінградскую ваен.-мед. акадэмію (1921). Працаваў у Мінску, Кіславодску. Удзельнік Вял. Айч. вайны. Дырэктар і кіраўнік аддзела Бел. НДІ неўралогіі, нейрахірургіі і фізіятэрапіі (1949—70), гал. фізіятэрапеўт-курартолаг Мін-ва аховы здароўя БССР з 1955. Асн. працы па эксперым. і клінічным даследаванні мінер. водаў, сапрапелевых граязяў і клімату Беларусі. Узнаг. ордэнам Чырв. Зоркі, медалямі.

Тв.: Белорусские сапропели и их лечебное применение, у кн.: Сапропели и их использование, Мн., 1958; Курортные места и лечебные источники Белоруссии, Мн., 1965.

КАЛІФО́РНІЯ (California), Ніжняя Каліфорнія, паўвостраў на З Паўн. Амерыкі, у Мексіцы. Ад мацерыка аддзяляецца Каліфарнійскім залівам. Даўж. 1200 *км*, шыр. 50—250 *км*. Пл. каля 144 тыс. *км*². Паверхня пераважна ўзгорыстая, найвыш. пункт г. Ла-Энкантада (3078 *м*). Радовішчы медзі, кобальту, магнезіту, марганцу. Клімат сухі, на Пн субтрапічны, на Пд трапічны. Расліннасць паўпустынная і пустынная. Нас. каля 700 тыс. чал. (1967). Жывёлагадоўля, садоўніцтва. Промысел крэветак і жэмчугу, здабыча солі з мора.

КАЛІФО́РНІЯ (California), штат ЗША на ўзбярэжжы Ціхага акіяна. Пл. 411 тыс. *км*². Нас. 19,7 млн. чал. (1970). Адм. ц. Сакраменто. Вял. гарады і прамысл. цэнтры (тыс. ж., 1970): Лос-Анджэлес (2782), Сан-Францыска (704), Сан-Дыега (676), Сан-Хасэ (437), Окленд (358). З Пн на Пд цягнуцца 2 горныя сістэмы: Сьера-Невада (г. Уітні выш. 4418 *м*) і Берагавыя хрыбты; паміж імі Каліфарнійская даліна. На ПдУ пустынныя плато і тэктанічныя ўпадзіны (даліна Смерці — 85 *м* ніжэй узр. м.). Клімат на Пн і ў гарах умераны, на ўзбярэжжы міжземнаморскі, на ПдУ гарачы і сухі. Гал. рэкі: Сакраменто, Сан-Хаакін і Каларада. К. самы эканамічна развіты штат ЗША. Кошт валавога прадукту (1969) 109 млрд. дол. Здабыча нафты (51 млн. *т*, 1969), прыроднага газу, цынку, волата, ртуці, жал. руды. Асн. галіны прамысл.: ракетна-касмічная (раён Лос-Анджэлеса канцэнтруе ⅓ частку ўсіх рабочых, занятых у гэтай галіне ў ЗША), авіяцыйная і радыёэлектронная — заняты пераважна выпускам ваен. прадукцыі. Развіта судна- і аўтамабілебудаванне, чорная і каляровая металургія, харч., хім., дрэваапр. і мэблевая прамысловасць. У Галівудзе (частка г. Лос-Анджэлеса) кінапрамысловасць. У с. гасп. гал. роля належыць вырошчванню бавоўніку, агародніны, цытрусавых і вінаграду. Каля 3 млн. *га* зямлі арашаецца. Гадуюць буйн. раг. жывёлу і авечак. Транспарт марскі (гал. порты Сан-Францыска, Лос-Анджэлес, Сан-Дыега), аўтамабільны і чыгуначны.

КАЛІЯНІС (Koligiánnēs) Канстанцінас (н. 26.6.1909, акруга Фівы), дзеяч рабочага руху Грэцыі. З сялян. З 1931 чл. кампартыі Грэцыі (КПГ). Займаў розныя пасады ў парт. органах. Няраз знявольваўся. У 1943 уцёк з ссылкі, быў на палітработе ў грэч. Нар.-вызв. арміі. З 1945 кандыдат, з 1948 чл. ЦК КПГ. У перыяд грамадз. вайны ў Грэцыі быў у 1947—49 на парт. рабоце ў Дэмакр. арміі. У 1950—52 кандыдат, у 1952—56 чл. Палітбюро ЦК КПГ. У 1956—57 чл. часовага органа КПГ — Бюро ЦК. З 1957 чл. Палітбюро ЦК КПГ, з 1961 першы сакратар ЦК КПГ. Узначальваў дэлегацыі КПГ на XXII і XXIV з'ездах КПСС, у складзе дэлегацый КПГ удзельнічаў у маскоўскіх Нарадах камуніст. і рабочых партый 1957, 1960 і 1969 (кіраўнік дэлегацыі).

КАЛМАГО́РАЎ Андрэй Мікалаевіч [н. 12 (25).4.1903, Тамбоў], савецкі матэматык. Акад. АН СССР (1939). Герой Сац. Працы (1963). Скончыў Маск. ун-т (1925). З 1931 праф. гэтага ун-та. Асн. працы належаць да многіх галін матэматыкі: тэорыі функцый сапраўднага пераменнага, тэорыі прыбліжэння функцый і функцыянальнага аналізу, матэм. логікі, тапалогіі, агульнай тэорыі сувязі, тэорыі імавернасцей. Залажыў асновы тэорыі маркаўскіх працэсаў. Дзярж. прэмія СССР 1941. Ленінская прэмія 1965. Узнаг. 3 ордэнамі Леніна, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.



Літ.: Александров П. С. и Хинчин А. Я. Андрей Николаевич Колмогоров, «Успехи математических наук», 1953, т. 8, в. 3 (спіс прац К.); там жа, 1963, т. 18, в. 5 (спіс прац К.).

КАЛМАНО́ВІЧ Майсей Іосіфавіч (1888—1937), удзельнік барацьбы за ўладу Саветаў на Беларусі. Чл. КПСС з чэрв. 1917. З 1904 эсэр. З чэрв. 1917 вёў парт. работу ў Слуцку, з вер. чл. бальшавіцкай фракцыі выканкома Зах. фронту, з ліст. чл. і заг. аддзела ВРК Зах. фронту, камісар харчавання Аблвыкамзаха. У 1919 у к-це харчавання БССР, чл. Савета абароны і нарком харчавання Літбела, старшыня асобай харчкамісіі Зах. фронту. З канца 1920 на адказнай гасп. рабоце на Украіне, у Сібіры. У 1929—37 нам. наркома земляробства СССР, старшыня праўлення Дзярж. банка і нам. наркома фінансаў СССР і на інш. адказных пасадах. На XV з'ездзе ВКП(б) выбіраўся чл. ЦКК, на XVI—XVII канд. у чл. ЦК. На І—V Паўн.-Зах. абласных парт. канфер. выбіраўся чл. абл. к-та, на І з'ездзе КП(б)Б — чл. ЦБ, на II з'ездзе — чл. ЦК; чл. Палітбюро ЦК КП(б)ЛіБ (1919—20). Чл. ЦВК БССР і Літ.-Бел. ССР (1919), ВЦВК і ЦВК СССР.

КАЛМА́ТКА (Filago), род аднагадовых травяністых раслін сям. складанакветных. Вядома 37 відаў, пашыраных у Еўропе, Азіі, Паўн. Афрыцы. У СССР 7 відаў, на Беларусі 3.

Невялікія расліны з густым шарсцістым або лямцавым апушэннем. Лісце цэласнае. Кветкавыя кошыкі жаўтаватыя, сабраныя ў галоўкі ці шчыткападобныя суквецці. На Беларусі найб. пашыраныя: К. палявая (*F. arvensis*, нар. назвы: бледнік, касмотка, барадач, пучынкі) — лекавая расліна і К. малая (*F. minima*). Растуць у хваёвых лясах, абапал дарог, на палях як пустазелле. К. германская зрэдку вырошчваецца як дэкаратыўная.

Літ.: Флора БССР, т. 5, Мн., 1959.

КАЛМЫКО́Ў Аляксей Сяргеевіч (н. 1911, с. Пярова Касімаўскага пав. Разанскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). Чл. КПСС з 1943. У Чырв. Арміі з 1939. Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра на Пд ад Лоева Гомельскай вобл. 15.10.1943 у час пераправы сав. войск дывізіён на чале з К. зніштожыў 28 кулямётных і 12 агнявых кропак, 4 батарэі, адбіў 4 варожыя контратакі, гэтым садзейнічаў вызваленню в. Шчытцы. Жыве ў Маскве.

КАЛМЫЦКАЯ АЎТАНО́МНАЯ САВЕ́ЦКАЯ САЦЫЯЛІСТЫ́ЧНАЯ РЭСПУ́БЛІКА (Калмыкія), у складзе РСФСР. Утворана 20.10.1935. Размешчана на ПдУ Еўрапейскай ч. СССР. Пл. 75,9 тыс. *км*². Нас. 267 тыс. чал. (1971). Падзяляецца на 12 раёнаў; 3 гарады, 6 гар. пасёлкаў. Сталіца Эліста. Канстытуцыя



прынята Вярх. Саветам Калм. АССР 21.6.1937. Вышэйшыя органы дзярж. улады — Вярх. Савет, які выбіраецца на 4 гады, а ў перыяд паміж сесіямі — Прэзідыум Вярх. Савета рэспублікі. Вышэйшы выканаўча-распарадчы орган — Савет Міністраў. Мясц. органы дзярж. улады — раённыя, гарадскія, пасялковыя і сельскія Саветы дэпутатаў працоўных. Суд. сістэма: Вярх. суд Калм. АССР і раённыя нар. суды.

Прырода. Амаль уся тэр. К. размешчана ў межах Прыкаспійскай нізіны. Паверхня раўнінная, са шматлікімі саланчаковымі паніжэннямі, пахіленая да Каспійскага м.; Чорныя землі нізкай узр. акіяна. На З Ергені выш. да 168 *м*, на ПдЗ Кума-Манычская ўпадзіна. Карысныя выкапні: прыродны газ і нафта, спажыўная і глаўберава солі, буд. матэрыялы. Клімат рэзка кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. ад −8 да −4,8, ліп. 23—25,5 °С. Абс. мінімум да −40 °С. Вегет. перыяд 213 дзён (Эліста). Ападкаў ад 180 *мм* на ўзбярэжжы да 400 *мм* на З. На Чорных землях снегу амаль не бывае. Рэкі, якія сцякаюць з Ергеней, летам перасыхаюць. На мяжы з Дагестанам цячэ Кума; ле вада ідзе на арашэнне. Многа азёраў з мінер. вадой (Сарпінскія, Маныч-Гудзіла і інш.). Глебы на З чарназёмныя, на У каштанавыя і бурыя паўпустынныя з саланцамі і саланчакамі. На ПдУ пяскі. Расліннасць на З разнатраўна-кавыльная, на У пустынна-стэпавая. На берагах азёраў і на мелкаводдзі Каспійскага м. зараснікі трыснягу. З жывёл характэрны грызуны.

Насельніцтва. Калмыкі (34%), рускія, казахі і інш. Сярэдняя шчыльн. 3,5 чал. на 1 *км*², у зах. ч. да 20 чал. на 1 *км*². Гарадскога нас. 36%. Гарады Эліста (52 тыс. ж., 1971), Каспійскі, Гарадавікоўск.

Гістарычная даведка. Тэр. К. заселена з эпохі палеаліту. У 7—5 ст. да н. э. тут жылі скіфы, пазней сарматы, аланы; з 7 ст. н. э. на тэр. К. Хазарскі каганат, з 13 ст. *Залатая Арда*. У 1556 у складзе *Астраханскага ханства* далучана да Расіі. Продкі калмыкаў (айраты) — жывёлаводы, качавалі ў стэпах Цэнтр. Азіі. У 1609 частка калмыкаў добраахвотна прыняла расійскае падданства, рассялілася ў Прыволжы і ўтварыла Калмыцкае ханства (да 1771). Далучэнне да Расіі спрыяла эканам. развіццю К., пазбавіла яе ад феад. міжусобіц. Рус. дзяржава выкарыстоўвала калмыкаў для аховы паўд. граніц і ў войнах 17—18 ст. Калмыкі ўдзельнічалі ў сялянскіх войнах пад кіраўніцтвам С. Ц. Разіна і Е. І. Пугачова. Да Кастр. рэвалюцыі ў К. панаваў феад.-патрыярхальны ўклад жыцця, 83% калмыкаў былі качэўнікамі, 75% гаспадарак бядняцкімі.

Сав. ўлада ўстаноўлена ў лют.— сак. 1918. Працоўныя К. сфарміравалі 2 кав. палкі для барацьбы з дзянікінцамі. Пасля выгнання белагвардзейцаў у ліп. 1920 адбыўся Усекалмыцкі з'езд Саветаў. 4.11.1920 утворана Калм. аўт. вобл. у складзе РСФСР, з 1935 — Калм. АССР. У 1921 аформіліся парт. і камсамольская арг-цыі К. За гады перадваенных пяцігодак закончаны калектывізацыя с. гасп. і пераход да аселасці, пабудаваны прамысл. прадпрыемствы. У Айч. вайну частка К. акупавана нямфаш. захопнікамі (жн. 1942 — студз. 1943). Калм. народ гераічна змагаўся з акупантамі на франтах, у партыз. атрадах: сфарміраваны 2 калм. нац. дывізіі; каля 8 тыс. воінаў з К. ўзнаг. ордэнамі і медалямі, 20 чал. удастоены звання Героя Сав. Саюза. У 1943 Калм. АССР ліквідавана, 9.1.1957 адноўлена Калм. аўт. вобл., 26.7.1958 — Калм. АССР. У 1959 Калм. АССР узнаг. ордэнам Леніна, у 1970 ордэнам Кастр. Рэвалюцыі.

Народная гаспадарка. Аснова эканомікі — сельская гасп. (у ёй занята ²/₃ насельніцтва). К.— важны жывёлагадоўчы і збожжавытворчы раён. У складзе с.-г. угоддзяў 68,2% пашы, 19 ворных зямель, 12,8% сенажацяў. Каля 2 млн. *га* пашы на Чорных землях выкарыстоўваюць суседнія вобласці і рэспублікі. У К. 21 калгас і 64 саўгасы (1.1. 1971). На пач. 1971 (тыс. галоў) буйн. раг. жывёлы 331,2 (у т. л. кароў 110,3), авечак і коз 2350,8, свіней 60,6. Авечкагадоўля дае 54% таварнай прадукцыі с. гаспадаркі. 95% пагалоўя складаюць танкарунныя, каля 5% каракульскія авечкі (пераважна на ПдУ). Буйн. раг. жывёлу (калмыцкую пароду) гадуюць усюды. Земляробства больш развіта на З і ПнЗ. Пасяўная пл. (тыс. *га*, 1970) 850, з іх пад збожжавымі 407,8, тэхн. 10,7, агародніна-бахчавымі 5,4, кармавымі 426. Асн. збожжавыя культуры ячмень (197,3 тыс. *га*) і шпаніца (163,9 тыс. *га*). Арашаецца 47,4 тыс. *га* зямель (1970). На арашаных землях вырошчваецца рыс, агародніна, бахчавыя культуры. Харч. прамысловасць дае 40,2% валавой прадукцыі ўсёй прамысловасці. Мясакамбінаты ў Каспійскім і Элісце, малочны з-д у Элісце, рыбныя ў Яшалце і Камсамольскім, масласырзавод у Яшалце. Маш.-буд. з-д у Каспійскім, аўтарамонтны ў Элісце. Прамысловасць лёгкая і буд. матэрыялаў. Развіваецца нафтавая і газавая прамысловасць. Рыбалоўства. Даўж. чыг. 154 *км* (Эліста — Светлаград, Астрахань — Кізляр). Аўтамаб. дарог 3,9 тыс. *км*, у т. л. з цвёрдым пакрыццём 349 *км*.

Эліста. Вуліца Леніна.





Атара авечак у калгасе імя Леніна Чорназемельскага раёна.

Ахова здароўя. У 1913 на тэр. Калм. АССР было 7 бальнічных устаноў на 50 ложкаў (5,4 на 10 тыс. ж.), 5 урачоў (0,3 на 10 тыс. ж.), 9 чал. сярэдняга мед. персаналу. У 1940 было 22 бальнічныя ўстановы на 430 ложкаў (22,5 на 10 тыс. ж.), 60 урачоў (3 на 10 тыс. ж.), 182 чал. сярэдняга мед. персаналу (9 на 10 тыс. ж.). На пач. 1971 працавалі 84 бальнічныя ўстановы на 2,5 тыс. ложкаў (101 на 10 тыс. ж.), 98 урачэбных амбулаторна-паліклінічных устаноў, 410 урачоў (16,8 на 10 тыс. ж.), 1325 чал. сярэдняга мед. персаналу (54,2 на 10 тыс. ж.), 1 санаторый.

Культура. У 1914 у К. былі толькі пач. школы (78), у якіх займалася 3988 навучэнцаў. Пасля ўстанаўлення Сав. улады ліквідавана непісьменнасць, ажыццёўлена ўсеагульнае навучанне на роднай мове. У 1970/71 навуч. г. працавала 282 агульнаадук. школы ўсіх тыпаў (68,2 тыс. вучняў), 5 сярэдніх спец. навуч. устаноў (5,5 тыс. чал.), *Калмыцкі універсітэт* (2,5 тыс. чал.). У рэсп. (на 1.1.1971) музей, 163 масавыя б-кі, 185 клубных устаноў, тэлецэнтр; 6 навук. устаноў, у т. л. НДІ гісторыі, культуры і мовы; мясной жывёлагадоўлі. У 1970 выходзіла 14 газет, з іх 3 рэспубліканскія.

Багатая нар. творчасць калмыкаў. Шырока вядомы гераічны эпас *«Джангар»*. У грамада. вайну зарадзілася калм. рэвалюц. паэзія, адным з пачынальнікаў якой быў паліткамісар, паэт-песеннік Х. Б. Канукаў. За гады Сав. улады выраслі плеяда празаікаў, паэтаў, драматургаў: Б. Басангаў, С. Каляеў, Х. Сян-Бельгін, Н. Манджыеў, А. Сусееў, Д. *Кугультінаў*, Л. Інджыеў, Б. Джымбінаў і інш. У 60-я г. ў калм. л-ру прыйшлі першая калмычка-паэтэса Б. Сангаджыева, А. Балакаеў, М. *Ханінаў*, Т. Бембееў, А. Бадмаеў, А. Джымбееў і інш. Гал. жанрам калм. л-ры да пядзіняга часу была паэзія. У 60-я г. напісаны раманы «Верны шлях» Б. Дарджыева, «Дачка Ольды» Л. Інджыева, «Маныч-рака» М. Нармаева, «Зоры над Элістой» А. Балакаева, «Беражы агонь» К. Эрэнджэнава і інш. У перакл. на калм. мову выйшлі «Вершы» Я. Купалы (1962), «Вершы» Я. Коласа (1962). На бел. мове выдадзены аб. вершаў М. Ханінава «Хвоі і цюльпаны» (1970), перакл. паасобныя творы В. Джымбінава, М. Ханінава і інш.

Жыллём калмыкаў-качэўнікаў служыла каркасная кібітка (гер). З пашырэннем ламаізму будаваліся манастыры-хурулы, гал. храмы якіх (звычайна 2—3-ярусныя, пірамідальныя) упрыгожваліся разьбою, роспісам, скульптурай, абразамі. Нар. мастацтва К. склалася ва ўмовах качавога быту. Разьба і роспіс упрыгожвалі драўляныя часткі юртаў, мэблю, хатняе начынне; цісненнем рабілі ўзоры на вырабах са скуры; сярэбраныя вырабы ўпрыгожвалі чэрню, гравіроўкаю, чаканкаю; жаночае адзенне аздаблялася вышыўкаю (залатымі і сярэбранымі ніткамі з каляровай шэрсцю, тасьмою, бісерам). У сав. час гарады (Эліста, Каспійскі і інш.) і пасёлкі забудоўваюцца дамамі сучаснай архітэктуры. Сярод архітэктараў: Дж. і М. Пюрвеевы, В. Цялегін, В. Савельеў і інш. Развіваецца выяўл. мастацтва (жывапісцы К. Альдаеў, Г. Ракчынскі, тэатр. мастак Дз. Сычоў, графік Б. Данільчанка, скульптар М. Санджыеў і інш.).

Сярод жанраў калмыцкай нар. музыкі вылучаецца эпас «Джангар». Асн. групы нар. песень: працяжныя, імправізацыйна-варыяцыйныя ст дуп і кароткія куплетныя ахр дун. Свецкай інстр. музыкі да рэвалюцыі амаль не было, у будыйскім культе выкарыстоўваліся аркестры з нац. духавых і ўдарных інструментаў. У сав. час створаны муз. ўстановы (у 1930 Калмыцкі тэхнікум мастацтваў з муз. аддзяленнем у Астрахані, у 1937 муз. школа і Дзярж. ансамбль песні і танца ў Элісце, у 1961 муз. вучылішча), выдадзены аборнікі нар. песень (першы ў 1934, запісы М. Трытуза), развілася муз. самадзейнасць. Першы нац. муз. спектакль («Улан сар» — «Чырвоны месяц») паказаны ў Саратаве ў 1931. З муз. дзеячаў: кампазітар С. Дорджыеў, спявачкі В. Гараева, В. Ільцаранава, У. Ліджыева.

Да Кастр. рэвалюцыі калмыкі не мелі т-ра. У 1925 у Астрахані арганізавана драм. школа. У 1936 створаны калм. драм. т-р (Эліста; калм. і рус. трупы, з 1963 імя Басангава). У рэпертуары п'есы калм. сав. драматургаў Б. Басангава, Б. Эрдніева, Х. Сян-Бельгіна, А. Сусеева, В. Сангаджыевай. У т-ры працуюць (1971): засл. арт. РСФСР і Калм. АССР М. Эрыджэнаў, засл. арт. РСФСР Э. Г. Манджыеў, засл. дз. маст. Калм. АССР Л. Аляксандраў, засл. арт. Калм. АССР У. Ліджыева і інш.

К. М. Альдаеў. Герой грамадзянскай вайны А. І. Гарадавікоў. 1967. Рэспубліканскі музей Калмыцкай АССР. Эліста.



Літ.: Очерки истории Калмыцкой АССР. Дооктябрьский период, М., 1967; Очерки истории Калмыцкой АССР. Эпоха социализма, М., 1970; Калмыкия в Великой Отечественной войне 1941—1945. Документы и материалы, Элиста, 1966; Клюкин Н. В. и Манджиев С. В. Калмыцкая АССР. Экономико-географический очерк, Элиста, 1970; Федюков А. Н. Природа Калмыцкой АССР, Элиста, 1969; Очерки истории калмыцкой литературы, Элиста, 1967; Калмыцкая художественная литература на подъеме, Элиста, 1962; Поэты Калмыкии, пер. с калмыцкого, М., 1970; Мацаков И. М. Современная калмыцкая проза, Элиста, 1970; Трошин И. И. Изобразительное искусство Советской Калмыкии, Элиста, 1965; яго ж. Очерки изобразительного искусства Калмыкии, Волгоград, 1970; О калмыцком прикладном искусстве, Волгоград, 1967; Тритуз М. А. Музыкальная культура Калмыцкой АССР, М., 1965; Пюрвеев В. Д. Калмыцкая драматургия, Элиста, 1970.

В. С. Шаплыка (прырода, нар. гасп.). Мінск; *У. Э. Эрдніеў* (гістар. даведка). Эліста.

КАЛМЫЦКІ УНІВЕРСІТЭ́Т, вышэйшая навуч. ўстанова. Засн. ў 1970 у г. Эліста на базе Калмыцкага пед. ін-та (з 1964). Ф-ты ў 1970/71 навуч. г.: фізіка-матэматычны, біялагічны, філалагічны, сельскагаспадарчы, агульнатэхнічны. Навучанне дзённае, вячэрняе і завочнае.

КА́ЛНЫНЬ (Kalniņš) Алфрэд Янавіч [11 (23).8.1879, г. Вендэн Ліфляндскай губ.— 23.12. 1951], латышскі савецкі кампазітар і арганіст. Нар. арт. Латв. ССР (1945). Заснавальнік лат. нац. оперы. Вучыўся ў Пецярбургскай кансерваторыі (1897—1901). З 1947 праф. кансерваторыі ў Рызе. З твораў: оперы «Банюта» (1919), «Астравіцяне» («Абуджэнне радзімы», 1924), балет «Стабураг» (1941), кантаты, сімф. сюіты, у т. л. «10 латышскіх народных песень» (1950), п'есы для фп., аргана, рамансы.

КАЛО́ВІЧЫ, вёска ў Вілейскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 5 *км* на ПнЗ ад Вілейкі, 108 *км* ад Мінска, на аўтамаб. дарозе г. Вілейка — г. п. Мядзел. 395 ж., двароў 147 (1971). Пачатковая школа, клуб, аддзяленне сувязі, магазін.

КАЛО́ДЗЕЖЫ, вёска ў Чэрвеньскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 12 *км* на У ад Чэрвеня, 74 *км* ад Мінска, 40 *км* ад чыг. ст. Пухавічы. 752 ж., двароў 225 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт. У 1943 вёску часткова спалілі ням. захопнікі. 2 брацкія магілы сав. воінаў Айч. вайны.

КАЛО́ДЗІЙ Іван Міхайлавіч (1912, в. Кіеўка Акмолінскага пав.— 1959), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). На фронце з 1942 — радыётэлеграфіст. Вызначыўся каля Лоева Гомельскай вобл. 15.10.1943 у час пераправы цяжка паранены К. фарсіраваў Дняпро, наладзіў сувязь з артыл. батарэяй і карэкціраваў яе агонь. Было знішчана 16 агнявых кропак, 3 батарэі, адбіта некалькі варожых контратак.

КАЛО́ДЗІШЧАНСКАЕ КАМУНІСТЫ́ЧНАЕ ПАДПО́ЛЛЕ ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Дзейнічала ў Калодзішчанскім с/с Мінскага р-на з ліп. 1941 да ліп. 1944 пад кіраўніцтвам *Мінскага камуністычнага падполля.* Першая падпольная група «Чыгуначная» (пазней «Удар») арганізавана ў ліп. 1941 на ст. Калодзішчы (кіраўнікі С. Э. Эрдман, М. М. Афанасьеў), у жніўні 1941 — у пас. Калодзішчы (кіраўнікі А. С. Старасціна, А. Я. Радзюк), у лістападзе 1941 — група моладзі (кіраўнікі М. І. Каласоўскі, У. Л. Панасюк), групы ў в. Старына, Вадапой, у снеж. 1941 — у Калодзішчанскім шпіталі група «Лазарэтная» (кіраўнік Л. М. Сакалова). У жн. 1941 чл. Мінскага камуніст. падполля М. Ф. *Малаковіч* аб'яднала і ўзначаліла падпольныя групы, у якіх з канца 1942 аб'яднана 66 чл. (5 камуністаў, 30 камсамольцаў, 27 беспартыйных, 4 піянеры). Падпольшчыкі мелі рэгулярную сувязь з Мінскім камуністычным падполлем (праз М. Б. *Осіпаву*, А. Ф. Верамейчык, Н. І. Сярову), вялі паліт. агітацыю сярод насельніцтва, арганізоўвалі сабатаж мерапрыемстваў акупантаў, распаўсюджвалі сав. лістоўкі, падпольную газ. «Звязда». Мелі 2 радыёпрыёмнікі, з дапамогай якіх прымалі, а потым распаўсюджвалі зводкі Саўінфармбюро. Наладзілі сувязь з партыз. брыгадамі «Разгром» (праз разведчыцу Г. А. Фінскую), імя Шчорса, «Дзядзькі Колі», з спец. групай Чырв. Арміі капітана Бухава (праз Г. І. Кулікову), здабывалі ў ворага і перадавалі партызанам зброю, узрыўчатку (5 мінамётаў, каля 10 кулямётаў, 15 рэвальвераў, больш за 100 вінтовак, 200 мін і гранат, больш за 20 тыс. патронаў), забяспечвалі партызанаў медыкаментамі, перавязачнымі сродкамі, перадавалі паперу, капіравальныя прылады, камплекты батарэй для прыёмнікаў, бланкі ням. дакументаў, пропускаў. Паведамлялі партызанам звесткі пра перамяшчэнне варожых войск і грузаў, склалі схемы варожых гарнізонаў, складаў боепрыпасаў, бензасховішчаў, перапраўлялі да партызанаў сав. патрыётаў, падказвалі партызанам найб. зручныя мясціны для падрыву эшалонаў. Партызаны прыходзілі на явачныя кватэры падпольшчыкаў, каб праводзіць сумесныя дыверсіі на варожых камунікацыях. У выніку агіт. дзейнасці падпольшчыкаў да партызанаў перапраўлены многія салдаты з варожых фарміраванняў. Падпольшчыкі наладзілі ўцёкі з канцлагераў і пераправілі да партызанаў вялікую групу ваеннапалонных, некалькі сот жыхароў Калодзішчанскага с/с. Увосень 1941 падпольшчыкі ўзарвалі малочны пункт, склад боепрыпасаў. Сумесна з партызанамі правялі некалькі дыверсій на чыгунцы: у чэрв. 1943 В. Л. Панасюк (Елізарава), Л. І. Баршчэўская з партызанамі групы Лютарэвіча падрывам чыгункі на перагоне Калодзішчы — Азярышчы разбілі 3 вагоны, рух на чыгунцы спынілі на некалькі гадзін; у жн. 1943 падпольшчыца В. Л. Панасюк з партызанамі ўзарвала броневагон з аховай, у вер. 1943 выбухам на перагоне Гарадзішча — Калодзішчы У. К. Глазуноў, У. І. Карповіч пашкодзілі паравоз і 4 вагоны, затрымалі рух на 8 гадзін. Чл. групы «Чыгуначная» засыпалі ў буксы пясок, метал. пілавінне, спынялі рух на чыгунцы па «тэхнічных прычынах». У жн. 1943 фашысты арыштавалі і закатавалі некалькіх падпольшчыкаў, у т. л. Малаковіч, Радзюк. Многія падпольшчыкі пайшлі да партызанаў. У крас. 1944 фашысты арыштавалі 20 мясцовых жыхароў, у т. л. некалькі

падпольшчыкаў. Аднак да дня вызвалення Мінскага р-на Чырв. Арміяй у падполлі дзейнічалі Т. Дз. Верашчагіна, Г. Дз. Каляда, І. М. Кавалёў, У. А. Кучмель, М. І. Лагуноўскі, М. М. Заплацінскі і інш.

Літ.: О партийном подполье в Минске в годы Великой Отечественной войны, Мн., 1961; Ус А. і Уладзімірава А. На семнаццатым кіламетры, «Маладосць», 1969, № 10; Николаев Н. Я. Минские молодогвардейцы, Мн., 1968.

В. А. Каструкова, А. В. Рогаў. Мінск.

КАЛО́ДЗІШЧЫ, вёска ў Мінскім р-не, чыг. ст. на лініі Мінск — Орша. Цэнтр сельсавета. За 17 *км* на ПнУ ад Мінска. 6560 ж., двароў 960 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання, лясніцтва. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, дзіцячыя яслі, бальніца, аддз. сувязі, 6 магазінаў.

КАЛО́ДКА Мікалай Аляксеевіч (10.5.1923, г. Шостка Чарнігаўскай губ.— 29.6.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Канд. у чл. КПСС. На фронце з 1942. Вызначыўся ў Магілёўскай вобл. 28.6.1944 рота на чале з К. захапіла пераправу, фарсіравала Бярэзіну каля Бабруйска, вызваліла в. Шчаткава. 29.6.1944 К. з 12 байцамі адбіў 11 варожых контратак, падбіў 3 самаходныя гарматы «Фердынанд», каля 30 аўтамашын. Загінуў, адбіваючы контратаку.

КАЛО́ДНІЦА, вёска ў Вялікахальнявіцкім с/с Крупскага р-на Мінскай вобл., каля воз. Сялява (2 *км*). Цэнтр калгаса «Авангард». За 46 *км* на Пн ад Крупак, 164 *км* ад Мінска, 36 *км* ад чыг. ст. Бобр. 319 ж., гасп. 98 (1971). Пач. школа, магазін.

КАЛО́ЖСКАЯ ЦАРКВА́, адна з назваў старажытнарускай *Барысаглебскай царквы* 12 ст. ў Гродне. Назва паявілася ў 15 ст. ў сувязі з перасяленнем на тэр. каля Барысаглебскай ц. часткі жыхароў з Каложы (прыгарад Пскова), якіх узяў у палон у 1405 літ. кн. Вітаўт.

КАЛО́ІДНАЯ ХІМІЯ, навука, якая вывучае ўласцівасці гетэрагенных высокадысперсных сістэм і працэсы, што ў іх адбываюцца. Складаецца з раздзелаў: малекулярна-кінетычныя з'явы ў дысперсных сістэмах *(броўнаўскі рух, дыфузія, осмас, седыментацыя)*; тэорыя ўтварэння новай фазы (узнікненне і рост зародкаў з метастабільных сістэм, метады атрымання дысперсных сістэм); *паверхневыя з'явы* (*адсорбцыя*, змочванне); устойлівасць, стабілізацыя і каагуляцыя дысперсных сістэм; аптычныя ўласцівасці іх (святлорассейванне); эл. і *электракінетычныя з'явы* ў дысперсных сістэмах (электрафарэз, электраосмас, падвойны эл. слой); структурна-механічныя ўласцівасці дысперсных сістэм. Метады даследаванняў: для раздзялення і фракцыянавання калоідных сістэм ужываюць *дыяліз*, электрадыяліз, ультрафільтрацыю, ультрацэнтрыфугаванне, *электроліз*, электраосмас; для вызначэння памераў часцінак (дысперснасці) дысперснай фазы — нефеламетрыю, ультрамікраскапію, электронную мікраскапію, *электронаграфію* і рэнтгенаграфію.

Многія калоідныя сістэмы *(золі)* і іх уласцівасці былі вядомы і выкарыстоўваліся чалавекам з глыбокай старажытнасці. Развіццё К. х. як самастойнай навукі (1861) звязана з працамі англ. вучонага Т. Грэма. Сістэматычнае вывучэнне *калоідаў* пачалося з 20 ст., калі вынайшлі і ўкаранілі новыя метады даследавання: электронную мікраскапію, рэнтгенаграфію, электронаграфію і інш. Эксперым. даследаванні спрыялі развіццю тэорыі. Калоідныя сістэмы, што вывучае К. х., маюць памеры часцінак 10^{-5}—10^{-7} *см* і характарызуюцца вельмі вялікай паверхняй падзелу паміж дысперснай фазай і дысперсійным асяроддзем (гл. *Дысперсныя сістэмы*). Ад сапраўдных раствораў калоідныя адрозніваюцца памерамі часцінак і самой прыродай іх, а таксама наяўнасцю мяжы падзелу паміж фазамі. Часцінкі дысперснай фазы ў калоідных сістэмах — агрэгаты з атамаў, малекул і іонаў, маюць аднайменны эл. зарад. Увесь агрэгат у растворы электранейтральны і наз. міцэлай. Эл. зарад разам з сальватнымі абалонкамі надае калоідам агрэгатыўную ўстойлівасць (устойлівасць супраць узбуйнення часцінак). Кінетычная ўстойлівасць іх залежыць ад памераў часцінак (ступені дысперснасці). Калоідныя сістэмы тэрмадынамічна няўстойлівыя і здольныя да самаадвольнай *каагуляцыі* і каалесцэнцыі. Павялічыць устойлівасць можна стварэннем ахоўных абалонак на паверхні часцінак. К. х. таксама вывучае *суспензіі, эмульсіі, пены*, порыстыя дысперсныя целы (адсарбенты, каталізатары), *аэразолі*, паўкалоіды, структураваныя сістэмы *(гелі)*.

Развіццё К. х. мае вял. значэнне для тэхналогіі буд. матэрыялаў, сілікатаў, лакаў, фарбаў, палімерных матэрыялаў, матэрыялаў для новай тэхнікі, узбагачэння карысных выкапняў, здрабнення цвёрдых целаў, а таксама ў працэсах фарбавання, дублення, мыйнага дзеяння, вода- і газаачысткі, у земляробстве (вапнаванне глебы). З К. х. звязаны амаль усе галіны харч. прамысловасці. У БССР даследаванні па К. х. праводзяцца ў Ін-це агульнай і неарган. хіміі АН БССР, на хім. ф-тах БДУ і тэхнал. ін-та.

Літ.: Воюцкий С. С. Курс коллоидной химии, М., 1964; Жуков И. И. Коллоидная химия, ч. 1, Л., 1949; Думанский А. В. Учение о коллоидах, 3 изд., М.— Л., 1948; Пасынский А. Г. Коллоидная химия, 3 изд., М., 1968.

Ф. М. Капуцкі. Мінск.

КАЛО́ІДЫ, калоідныя сістэмы (грэч. kolla клей+eidos від), *дысперсныя сістэмы*, якія складаюцца з вельмі дробных часцінак рэчыва (10^{-5}—10^{-7} *см*), раўнамерна размеркаваных у аднародным асяроддзі; тое, што *золі*. Вывучаюцца *калоіднай хіміяй*.

КАЛО́ЛА Праскоўя Лазараўна [н. 8(20).3. 1895, в. Падкасоўе Навагрудскага пав. Мінскай губ.], перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1949). Чл. КПСС з 1952. У 1940—53 у калгасах «Бальшавік», імя Леніна Любчанскага р-на Баранавіцкай вобл.: палявод, звеннявая па вырошчванні лёну. У 1953—58 нам. старшыні, у 1958—60 звеннявая ў калгасе імя Леніна Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл. Жыве ў Баранавічах.

КАЛО́МБА (Colombo), сталіца Цэйлона. Размешчана на паўд.-зах. узбярэжжы в-ва Цэйлон. Вузел чыг. і шашэйных дарог, важны порт у Індыйскім ак. Аэрапорт (міжнар.). Прамысл., гандл.-фін. і культурны цэнтр краіны. Нас. 551 тыс. ж. (1970). Харч. прамысл., пачатковая апрацоўка каўчуку, суднарамонтныя прадпрыемствы. Праўленні нац. і замежных гандл. кампаній і банкаў.

У сярэднія вякі горад вядомы пад назваю Калантота. У 1517 у К. ўмацаваліся партугальцы, у 1656 ім авалодалі галандцы. Быў захоплены (1796) англ. каланізатарамі. З 1948 сталіца дамі-



Каломенскі палац. Рысунак па гравюры Ф. Гільфердынга. 18 ст.

ніёна. Горад выцягнуты з Пн на Пд уздоўж узбярэжжа. Ад Вежы гадзінніка ў старым цэнтры адыходзяць 7 трансп. магістраляў, з будынкамі фірмаў, клубаў, гасцініц, асабнякамі, урадавымі будынкамі, шматлікімі храмамі. На Пд ад цэнтра — Алімпійскі і Імператарскі т-ры. Значную частку горада займае гавань. Як спадчына калан. залежнасці на ўскраінах паставаліся трушчобы беднаты і партовых рабочых. Ун-т, Нац. музей, Публічная б-ка, абсерваторыя.

КАЛО́МЕНСКАЕ, б. сяло (з 1960 частка Масквы), філіял *Гістарычнага музея* ў Маскве (з 1923); архітэктурны ансамбль 16—17 ст. Упершыню ўпамінаецца ў грамаце Івана Каліты каля 1339. У 15—17 ст. сядзіба рус. цароў. У Сялянскую вайну пад кіраўніцтвам І. І. Балотнікава 1606—07 у Каломенскім размяшчаўся лагер галоўных сіл паўстанцаў (1606). У 1667—68 тут пабудаваны *Каломенскі палац*.

КАЛО́МЕНСКІ ПАЛАЦ, помнік рускага грамадзянскага драўлянага дойлідства. Пабудаваны ў 1667—68 у царскай сядзібе Каломенскае (уваходзіць у межы Масквы). К. п. складанае спалучэнне малых і вялікіх (у некалькі паверхаў) зрубаў, накрытых разнастайнымі па форме дахамі. Палац меў багата аздобленыя інтэр'еры (роспіс на сценах і столі, залочаная разьба па дрэве, кафляныя печы і інш.). Арцель будаўнікоў узначальвалі С. Пятроў і І. Міхайлаў. Часткова перабудаваны ў 1681 С. Дзяменцевым. Усе разьбярныя работы выкананы выхадцамі з Беларусі майстрамі К. *Міхайлавым*, Г. *Акулавым*, Я. Іванавым і інш. (кіравалі работамі К. Міхайлаў і старац *Арсеній*). Арцель жывапісцаў узначальваў С. *Ушаков*. Палац разабраны ў 1768.

Літ.: Гра М. А. Коломенское, М., 1963; Абецедарский Л. С. Белорусы в Москве XVII в., Мн., 1957, с. 14—17.

КАЛО́МНА, горад абл. падпарадкавання ў Маскоўскай вобл. РСФСР. Размешчана на р. Ака пры ўпадзенні ў яе р. Масквы. Упершыню ўпамінаецца ў летапісах пад 1177. Чыг. станцыя, прыстань. 138 тыс. ж. (1971). З-ды: цеплавозабуд., унікальных цяжкіх станкоў, тэкст. машынабудавання, жалезабетонных канструкцый. Мэблевая ф-ка. Пед. ін-т, філіял Усесаюзнага завочнага політэхн. ін-та; 4 сярэднія спец. навуч. ўстановы. Зберагліся частка вежаў крамля (1525—31), Старагалутвінскі манастыр (канец 14 ст.) і інш. помнікі старажытнасці.

КАЛО́НА, рака, правы прыток р. Нараў (бас. Віслы). Даўж. 34 *км*, у БССР каля 29 *км*. У верхнім цячэнні наз. Калонка. Пачынаецца ў Свіслацкім р-не Гродзенскай вобл., цячэ па тэр. ПНР. Вадазбор (247 км²) на паўд.-зах. ускраіне Ваўкавыскага ўзв., у межах Белавежскай пушчы. Рэльеф — забалочаная і аблесеная раўніна. Гал. прытокі: Крапіўніца (левы), Лашанка, Яцвезь (правыя). Жыўленне мяшанае. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 1,1 *м*³/*сек*.

КАЛО́НА (ад лац. columna), архітэктурна апрацаваная вертыкальная апора, круглая ў папярочным сячэнні. К. паявілася ў дойлідстве многіх народаў як частка найб. простай стойкавабэлечнай канструкцыі (пры ёй драўляная стойка або каменны слуп нясуць гарызантальную бэльку перакрыцця) і стала элементам замацаваных традыцыямі сістэм арх. кампазіцыі (гл. *Ордэры*).

Гал. частка К.— ствол — часта патанчаецца ўверсе, можа набываць пры гэтым крывалінейныя абрысы або «прыпухласць» (энтазіс), часам апрацоўваецца вертыкальнымі жалабкамі (канелюрамі). Ствол звычайна ставіцца на больш ці менш складаную *базу* і ўвенчваецца капітэллю. Мастацкая выразнасць і значэнне, большая ці меншая манументальнасць К. вызначаецца яе прапорцыямі, чляненнямі, пластычнаю апрацоўкаю, а таксама адносінамі вышыні і дыяметра К. да інтэркалумнія (пралёт паміж дзвюма калонамі) і да абсалютных памераў збудавання. Асн. разнавіднасці К. і тыпы іх групоўкі (*каланады*, *порцікі*, *прапілеі*, *аркады* і інш.) створаны архітэктурай Ст. Усходу і антычнасці. Побач з К. як часткай будынка бываюць К.-стаўпы, якія сталіць асобна і з'яўляюцца мемарыяльным помнікам (Аляксандраўская К. на Палацавай пл. ў Ленінградзе, 1830—34, арх. А. Манферан; і інш.). У сучасным буд-ве К. называюць таксама метал. і жалезабетонныя апоры розпага сячэння.

Калоны: *1*, *2* — папірусападобныя (Ст. Егіпет); *3* — калоны з Кноса (крыта-мікенская культура); *4* — калона з Персепаля (Ст. Персія); *5* — дарычная; *6* — іанічная; *7* — карынфская; *8*, *9* — раманскія калоны; *10* — гатычная; *11*, *12* — калоны эпохі Адраджэння; *13* — спіралепадобныя калоны ў стылі барока.



Літ.: Всеобщая история архитектуры, т. 1, 2, 5, 7, М., 1963—70.

КАЛО́НІІ АНТЫЧНЫЯ (лац. colonia ад colo апрацоўваю), паселішчы, заснаваныя грэкамі і рымлянамі за межамі сваіх полісаў (гарадоў-дзяржаў).

Грэч. каланізацыя была найб. інтэнсіўная ў 8—6 ст. да н. э. Яе сац.-эканам. прычыны: перанасяленне ва ўмовах жорсткай барацьбы абезаямеленага свабоднага насельніцтва з земляробчай знаццю, нястача хлеба, войны, эміграцыя з метраполіі дэмакр. элементаў. К. а.— умацаваныя паселішчы, незалежныя ад метраполіі (свой дзярж. лад, заканадаўства), мелі з ёй цесныя гандл., культ. і рэліг. сувязі. У Італіі значнага росквіту дасягнулі Кумы, Тарэнт, у Сіцыліі — Сіракузы. Паявіліся ў Паўн. Афрыцы, на ўзбярэжжы Мармуровага і Чорнага м. (гл. *Антычныя гарады ў Паўночным Прычарнамор'і*). Першыя калоніі Ст. Рыма засн. ў ходзе завалявання Рымам Італікаў у 5 ст. да н. э. Падзяліліся на рым. і лацінскія (з абмежаваным правам рым. грамадзянства). Сталі цэнтрамі рымскай каланізацыі. Павінны былі змяшчаць супярэчнасці паміж рымлянамі і саюзнікамі, а таксама ў самім рымскім грамадстве. З часоў *Гракхаў* узніклі першыя рым. калоніі за межамі Італіі (Юнона на месцы Карфагена, Нарбон у Паўд. Галіі і інш.). Імператары Сула, Пампей, Цэзар, Антоній, Актавіян паслялялі ў К. а. сваіх ветэранаў. У перыяд імперыі сталі асаблівай катэгорыяй правінцыяльных гарадоў з рым. правам.

Літ.: Маркс К. и Энгельс Ф. Соч., т. 8, с. 567—568; Колобова К. М. К истории вопроса о греческой колонизации, «Вестник древней истории», 1949, № 2; Нечай Ф. М. Рим и италики, Мн., 1963. *Ф. М. Нячай.* Мінск.

КАЛОНЛІНЕ́ЙКА (ад франц. colonne слупок+*лінейка*), лінія над тэкстам старонкі кнігі, часопіса, газеты, над якою размяшчаюцца *калонтытул* і *калонлічба*.

КАЛОНЛІ́ЧБА, парадкавы нумар старонкі выдання (кнігі, часопіса, газеты), які змяшчаецца звычайна ў верхняй ці ніжняй частцы старонкі, найчасцей на вонкавым рагу.

КАЛО́НТАЙ (Kollątaj) Гуга (1.4.1750, в. Дадаркалы на Валыні — 28.2.1812), польскі асветнік, грамадскі дзеяч, філосаф-матэрыяліст. Скончыў Кракаўскі ун-т, атрымаў званне д-ра філасофіі (1768). У Рыме ў 1770 абараніў дысертацыю на званне д-ра права і багаслоўя. Актыўны дзеяч *Адукацыйнай камісіі*. У перыяд Чатырохгадовага сейма (1788—92) ідэолаг т. зв. Патрыятычнай партыі, адзін з аўтараў Канстытуцыі 3 мая 1791. У паўстанні 1794 пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі стаяў на чале рэспубліканцаў. У 1794—1802 быў зняволены ў аўстр. турму. Распрацаваў праграму бурж. пераўтварэнняў грамадскага і дзярж. ладу Польшчы. Выступаў супраць прыгону, змагаўся з каталіцкім абскурантызмам і патрабаваў набліжэння адукацыі да рэальных патрэб грамадства. У дэістычнай форме развіваў матэрыялізм. вучэнне аб прыродзе, разглядаў грамадства як частку матэрыяльнага свету, які падпарадкоўваецца вечным і нязменным заканамернасцям. Зрабіў уплыў на развіццё асветніцкай ідэалогіі на Беларусі.

Тв.: Ostatnia przestroga dla Polski, Warszawa, 1790; Rozbiór krytyczny zasad historji o początkach rodu ludzkiego, t. 1—3, Kraków, 1842; Stan oświecenia w Polsce w ostatnich latach panowania Augusta III, Wrocław, 1953; Listy anonima i prawo polityczne narodu polskiego, t. 1—2, Kraków, 1954; Porządek fizyczno-moralny..., Warszawa, 1955.

Літ.: Касьянова Е. В. Гуго Коллонтай — выдающийся польский философ-материалист конца XVIII — начала XIX века, «Вопросы философии», 1955, № 2; Осипова Е. В. Философия польского просвещения, М., 1961. *А. А. Бірала.* Мінск.

КАЛОНТЫТУЛ (ад франц. colonne слупок+лац. titulus надпіс, загаловак), загаловачныя звесткі (назва твора, часткі, раздзела, параграфа), якія змяшчаюцца звычайна над тэкстам старонкі (кнігі, часопіса, газеты).

У энцыклапед. выданнях і слоўніках, а таксама ў навук. і навуч. л-ры са складанай будовай тэксту К. замяніе змест (пералік падзагалоўкаў, раздзелаў), аблягчае шуканне патрэбнага матэрыялу. У часопісах у К. звычайна даюць прозвішча аўтара і назву твора, у газетах — загаловак, дату выпуску і парадкавы нумар газеты.

«КАЛО́ССЕ», літаратурна-навуковы часопіс, які выходзіў у 1935—39 у Вільні на бел. мове, пераважна паквартальна. Змяшчаў артыкулы па гісторыі культуры Беларусі, бел. мове і л-ры, краязнаўстве; публіцыстычныя, літ.-крытычныя і мастацкія творы. Ідэйны кірунак часопіса супярэчлівы, паколькі на яго старонках выступалі прадстаўнікі розных груп інтэлігенцыі Зах. Беларусі. Спачатку рэд. калегія часопіса складалася пераважна з памяркоўных клерыкалаў. Наступленне рэакцыі і фашызму на дэмакр. бел. арг-цыі і органы прагрэс. друку, з аднаго боку, і ўзмацненне створанага камуністамі Нар. фронту, з другога, прывяло да радыкалізацыі час. «Калоссе». На чале часопіса стала група, якая наз. сябе «супрацоўнікамі «Калосся»; у яе ўвайшлі прадстаўнікі дэмакратычнай інтэлігенцыі і камуністы. Узрастае ўплыў часопіса на развіццё прагрэсіўнай грамадскай думкі ў Заходняй Беларусі. Лепшыя яго матэрыялы выкрывалі рэакцыйную і шавіністычную ідэалогію фашызму, сацыяльны і нац. ўціск бел. народа. У часопісе выступалі з артыкуламі дзеячы КПЗБ, друкаваліся творы зах.-бел. пісьменнікаў (М. Танк, В. Таўлай, А. Іверс і інш.). Часопіс знаёміў чытачоў з творамі пісьменнікаў Сав. Беларусі. Разам з тым асобныя публіцыстычныя і літ.-крытычныя матэрыялы (С. Каліны, А. Станкевіча, А. Бужанскага) мелі бурж.-нацыяналістычны характар. Рэдактар-выдавец Я. Шутовіч. *У. А. Калеснік.* Брэст.

КАЛО́ЧЫН, археал. комплекс: два гарадзішчы і два паселішчы *мілаградскай культуры* (7—3 ст. да н. э.), ранняга этапу *зарубінецкай культуры* (3 ст. да н. э.— 1 ст. н. э.) і раннефеадальнага перыяду (6—9 ст.) каля в. Калочын Рачыцкага р-на Гомельскай вобл., на правым беразе Дняпра. Першае гарадзішча ўмацавана двума валамі і равамі памерам (*м*) 42×36.

Даследавалася Э. А. Сымановічам (1955—60). Пры раскопках знойдзены ляпны посуд, жалезныя прылады працы, гліняныя прасліцы. На паселішчы выяўлены 2 пахаванні з печамі-каменкамі і керамікa позняга этапа зарубінецкай культуры. Другое гарадзішча ўмацавана двума валамі; даследавалася В. М. Мельнікоўскай (1955, 1961). Пры раскопках знойдзены гліняны посуд, скіфскі бронзавы наканечнік стралы і інш.

Літ.: Сымонович Э. А. Городище Колочин I на Гомельщине, у кн.: Славяне накануне образования Киевской Руси, М., 1963 (Материалы и исследования по археологии СССР, № 108); Мельниковская О. Н. Племена Южной Белоруссии в раннем железном веке, М., 1967.

Л. Д. Побаль. Мінск.

КАЛО́ША Вольга Лукінічна [н. 12(25).1.1910, Адэса], перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1965). З 1949 палявод калгаса «Сцяг Леніна» Карэліцкага р-на Гродзенскай вобл., у 1954—69 звеняявая па вырошчванні лёну. Дэп. Вярх. Савета БССР 6-га скл. Жыве ў Мінску.

КАЛПА́КЧЫ Уладзімір Якаўлевіч [26.8(7.9). 1899, Кіеў — 17.5.1961], савецкі ваенны дзеяч, ген. арміі (1961). Герой Сав. Саюза (1945). З служачых. Чл. КПСС з 1918. Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1928). У арміі з 1916, у Чырв. гвардыі з 1917, потым у Чырв. Арміі. Удзельнік грамадз. вайны. З 1936 нам. нач. штаба БВА. У 1936—38 удзельнік грамадз. вайны ў Іспаніі на баку рэспубліканцаў. Да 1941 на паліт. і каманднай рабоце ў Чырв. Арміі. У Айч. вайну на Паўд., Бранскім, Паўд.-Зах., Данскім, Сталінградскім, Калінінскім, 2-м і 1-м Бел. франтах: нач. штаба арміі, фронту, нам. камандуючага войск фронту, камандуючы арміі. 63-я армія пад камандаваннем ген.-л. К. ўдзельнічала ў *Гомельска-Рэчыцкай аперацыі 1943*. У 1945—61 на камандных пасадах у Сав. Арміі. З 1961 нам. Галоўнакамандуючага сухапутных войск. Узнаг. 3 ордэнамі Леніна, 9 інш. ордэнамі, медалямі, ордэнам Іспанскай рэспублікі, ордэнам ПНР. Загінуў у час аварыі верталёта.

КАЛПЕ́НЬ, вёска ў Казярожскім с/с Лоеўскага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр калгаса «Дружба». За 13 *км* на З ад Лоева, 105 *км* ад Гомеля, 57 *км* ад чыг. ст. Рэчыца, на аўтамаб. дарозе г. п. Лоеў — в. Новая Баршчоўка. 547 ж., двароў 182 (1971). Васьмігадовая школа, Дом культуры, фельч.-ак. пункт, магазін.

КАЛУГА, горад, цэнтр Калужскай вобл. РСФСР. На р. Ака. Чыг. ст., прыстань. 217 тыс. ж. (1971). З-ды: машынабудаўнічы, абсталявання чыг. транспарту, прыладабуд., аўтамотаэлектраабсталявання, аўтарамонтны, радыёлямпавы, шклозавод, запалкава-мэблевы камбінат; ф-кі: швейная, трыкатажная, абутковая, муз. інструментаў «Акорд». Прадпрыемствы харч. прамысловасці. Пед. ін-т, філіял Маск. вышэйшага тэхн. вучылішча імя Баўмана; 11 сярэдніх спец. навуч. устаноў. Драм. тэатр, 4 музеі (краязнаўчы, мастацкі, мемарыяльны Дом-музей К. Э. Цыялкоўскага, Дзярж. музей гісторыі касманаўтыкі імя Цыялкоўскага).



К. ўзнікла як крэпасць на паўд.-зах. межах Маск. княства. Упершыню ўпамінаецца ў грамаце літ. кн. Альгерда ў 1371. У 1505—18 цэнтр удзельнага княства. Адзін з цэнтраў сялянскай вайны 1606—07 пад кіраўніцтвам І. І. Балотнікава. З 1708 у складзе Маскоўскай губ., з 1777 цэнтр Калужскага намесніцтва. У 17 — 1-й пал. 19 ст. значны гандл. горад Расіі. Сав. ўлада ўстаноўлена 28.11. (11.12).1917. У Айч. вайну К. акупавана ням.-фаш. захопнікамі (кастр. 1941—30.12.1942), разбурана. Пасля вайны адноўлена.

Літ.: Калуга. Путеводитель, Тула, 1968; Фехнер М. В. Калуга, М., 1961.

КАЛУЖСКАЯ ВО́БЛАСЦЬ, у складзе РСФСР. Утворана 5.7.1944. Размешчана ў вярхоўях Акі. Пл. 29,9 тыс. *км*². Нас. 993 тыс. чал. (1971). Падзяляецца на 23 раёны; 16 гарадоў, 15 гар. пасёлкаў. Цэнтр г. Калуга.

Паверхня ўзгорыста-раўнінная. На З заходзяць марэнныя грады Смаленскага ўзв., на ПдУ парэзанае Сярэднерускае ўзвышша, выш. да 275 *м*. З карысных выкапняў вял. запасы бурага вугалю (Падмаскоўны бас.), фасфарытаў, вапнякоў, вогнетрывалых глінаў, кварцавых пяскоў, торфу. Клімат умерана кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. −9,7, ліп. 18,9 °С. Ападкаў калі 600 *мм* за год. Вегет. перыяд 210 дзён. Найб. рака Ака з прытокамі Жыздра, Угра, Пратва. Многа штучных вадаёмаў. Глебы на З і Пн дзярнова-падзолістыя, у цэнтры і на Пд шэрыя лясныя. Пад лесам каля ⅓ тэр., пераважна на ПнУ. Значная плошча пад сухадольнымі і заліўнымі лугамі. Асн. насельніцтва — рускія. Сярэдняя шчыльн. 33,2 чал. на 1 км². Гарадскога нас. 53%. Найб. гарады: Калуга, Людзінава, Кіраў, Обнінск, Малаярославец.

Прамысловасць шматгаліновая. З-ды машынабудаўнічы, турбінны, аўтамотаэлектраабсталявання, камбінат сінт. духмяных рэчываў у Калузе; цеплавозабуд. з-д у Людзінаве, чыгуналіцейны і буд. фаянсу ў Кіраве. Прадпрыемствы папяровай і дрэваапр. прамысловасці; цэлюлозна-папяровы камбінат у Кондраве, запалкава-мэблевы камбінат «Гігант», ф-ка муз. інструментаў «Акорд» у Калузе, мэблевыя ф-кі ў Мядыні і Малаярославцы. Вытворчасць буд. матэрыялаў. Выраб шкла (Калуга, Еленскі), скульптурна-мастацкая ф-ка (Калуга). Лёгкая прамысловасць: Бароўская трыкатажная і суконная ф-кі, Ярмолінскі баваўняны камбінат, Калужская абутковая, Белавусаўская ткацкая, швейныя ф-кі. У Тарусе ф-ка маст. вышыўкі. Харч. прамысловасць. Здабыча бурага вугалю і вапнякоў. Калужская ЦЭЦ, атамная эл. станцыя ў Обнінску. На 1.1.1971 у вобласці 214 калгасаў і 158 саўгасаў. Пасяўная пл. (тыс. *га*, 1970) 929, з іх пад абожкавымі 409,3, кармавымі 409,8, агародніна-бахчавымі і бульбаю 92,9. Асн. збожжавыя культуры (тыс. *га*) пшаніца 134,6 і ячмень 106,1. Жывёлагадоўля малочна-мясная кірунку. На пач. 1971 было (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 544,4 (у т. л. кароў 259,9), свіней 304,5, авечак і коз 299,6. Даўж. чыгунак 868 *км*, шашэйных дарог 8,6 тыс. *км*, у т. л. з цвёрдым пакрыццём 2,2 тыс. *км* (1970). Пед. ін-т, філіял Маск. вышэйшага тэхн. вучылішча імя Баўмана; 21 сярэдняя спец. навуч. ўстанова. Драм. тэатр, 7 музеяў. Абл. газета «Знамя».

Літ.: Природа и сельское хозяйство Калужской области, Калуга, 1965; Российская Федерация. Центральная Россия, М., 1970 (Советский Союз).

Н. І. Журайская. Мінск.

КАЛУМБ (лац. Columbus, італьян. Colombo, ісп. Colón) Хрыстафор [29.10.1451(?), Генуя — 20.5.1506], мараплавец.



У 1492 на трох ісп. суднах перасек Атлантычны ак., дасягнуў Багамскіх а-воў, Кубы і Гаіці (гэты год лічыцца датай адкрыцця Амерыкі). Другая экспедыцыя (1493) адкрыла некалькі а-воў з групы Малых Антыльскіх, Пуэрта-Рыка, Ямайку, трэцяя (1498) — в-аў Трынідад і частку ўзбярэжжа Паўд. Амерыкі. У апошняе плаванне (1502—04) К. адкрыў усх. ўзбярэжжа Цэнтр. Амерыкі. Плаванні К.— важная частка *Вялікіх геаграфічных адкрыццяў*.

Літ.: Магидович И. П. Христофор Колумб, М., 1956; Путешествия Христофора Колумба. Дневники, письма, документы, пер. с исп., М., 1961.

КАЛУМБА́РЫЙ (лац. columbarium), сховішча урнаў з прахам пасля крэмацыі. Будуюць на могілках і пры крэматорыях. У Ст. Рыме ставілі спец. будынкі з радамі паўкруглых ніш.

КАЛУМБІ́Т (ніабіт), мінерал класа вокіслаў (Mn, Fe) Nb_2O_6, крайні член ізаморфнага раду калумбіт — танталіт (Fe, Mn) Ta_2O_6. Руда для здабычы ніобію і танталу.

Хім. састаў К. не пастаянны. Змяшчае Nb_2O_5 да 78,9%, Ta_2O_5 да 83,6%, прымесі Ti, Sn, рэдкіх зямель TR, W, U, Sc і інш. Крышталізуецца ў рамбічнай сістэме. Форма крышталяў таблітчастая, пласцінчатая, прызматычная. Агрэгаты зярністыя. Колер жалеза-чорны, буравата-чорны. Цв. 5,5—6,0; шчыльн. 5200 *кг/м*³ (павялічваецца ад колькасці танталу). Бляск металападобны. Радыеактыўны. Трапляецца ў магматычных пародах, пегматытавых жылах і ў россыпях. Радовішчы ў СССР, Паўд. Радэзіі, Рэсп. Заір, Нігерыі, Бразіліі, ЗША, Аўстраліі.

КАЛУМБІЯ (Columbia), рака на З Канады і ЗША. Даўж. 2250 *км*, пл. бас. 771 тыс. *км*². Пачынаецца ў Скалістых гарах, упадае ў Ціхі ак.

К. пераскае ў глыбокім каньёне Калумбійскае плато, пераразае Каскадныя горы. Гал. прыток Снэйк (левы). Жыўленне снегавое і дажджавое. Сярэдні гадавы расход вады каля Тэ-Далса 5571 *м*³/*сек*. На К. буйныя ГЭС: Гранд-Кулі, Чыф-Джозеф, Тэ-Далс. Суднаходная ад вусця на 1038 *км* (з абводнымі каналамі). Акіянскія судны падымаюцца да г. Ванкувер (на 160 *км*). Выкарыстоўваецца на арашэнне; лесасплаўная. На рацэ г. Рычленя і Ванкувер.

КАЛУМБІЯ, Рэспубліка Калумбія (República de Colombia), дзяржава на ПнЗ Паўд. Амерыкі. Пл. 1138,9 тыс. *км*². Нас. 22,2 млн. чал. (1970). Сталіца Багата. Краіна падзяляецца на 22 дэпартаменты, 3 інтэндэнсіі і 5 камісарый. К.— рэспубліка. Дзейнічае канстытуцыя 1886 (са зменамі 1945). На чале дзяржавы і ўрада — прэзідэнт, які выбіраецца на 4 гады. Вышэйшы заканадаўчы орган — кангрэс, складаецца з 2 палат: сената (яго члены выбіраюцца на 4 гады з ліку асоб, якія раней займалі адказныя пасады) і палаты прадстаўнікоў (яе члены выбіраюцца на 2 гады). Выканаўчая ўлада — кабінет міністраў.

Прырода. Паверхня К. падзяляецца на горы Захад і раўнінны Усход. Зах. частку займаюць горы Анды, якія складаюцца з трох хрыбтоў: Усходняй Кардыльеры (выш. да 5493 *м*) з шырокімі міжгорнымі плато; Цэнтральнай з конусамі патухлых (г. Уіла, 5750 *м*) і дзейных вулканаў (Руіс 5400 *м*, Таліма 5215 *м*) і Заходняй (выш. да 4250 *м*). Паміж хрыбтамі шырокія і глыбокія ўпадзіны — даліны рэк Магдалены і Каўкі. На Пн глыбавы масіў Сьера-Невада-дэ-Санта-Марта з найвыш. пунктам краіны г. Крыстобаль-Калон (5800 *м*). Каля ўзбярэжжа Ціхага ак. нізіна, каля Карыбскага м.— нізіна ніжняга цячэння Магдалены. Усх. частка К. занята вял. нізінамі і раўнінамі ў басейнах р. Арынока і Амазонка. Карысныя выкапні: нафта, кам. вугаль, волата, плаціна, серабро, ізумруды, уранавыя руды, баксіты. Клімат на нізінах экватарыяльны, з адным або двума сухімі перыядамі. Сярэднія месячныя т-ры ад 24 да 28 °С. Ападкаў ад 500 *мм* за год на Пн і ва ўнутраных далінах да 10 тыс. *мм* на Ціхаакіянскіх схілах. Рачная сетка густая. Гал. рэкі: Магдалена з Каўкай; Мета і Гуаўярэ (прытокі Арынока), Путумайо. Каля 60% тэр. К. пад

Багата. Плошча Сімона Балівара.





Від на горад Картахена.

лесам. У гарах вышынная пояснасць. Жывёльны свет: малпы, браняносец, ляпівец, ягуар; в птушак папугаі, калібры, туканы; ёсць кракадзілы, чарапахі, яшчаркі.

Насельніцтва. Большасць — калумбійцы, нацыя, якая склалася ад змяшання карэннага насельніцтва — індзейцаў з іспанскімі каланістамі і неграмі, завезенымі з Афрыкі, а таксама з больш позніх еўрап. імігрантамі. Метысаў 40% насельніцтва, белых 30, мулатаў 18, індзейцаў 7 і неграў 5%. Дзярж. мова іспанская, рэлігія каталіцкая. Сярэдняя шчыльн. 19,4 чал. на 1 км². Гарадскога насельніцтва 55% (1970). Найбольшыя гарады (тыс. чал., 1970): Багата (2600), Медэльін (1096,8), Калі (921,7), Баранкілья (648,2), Картахена (322,5).

Гістарычны нарыс. Тэр. К. была заселена шматлікімі індзейскімі плямёнамі (пераважна групы чыбча). Адкрыта іспанцамі ў 1499. Іспан. заваёўнікі ў 16 ст. арганізавалі тут калонію Новая Гранада. Жорсткая эксплуатацыя іспан. каланізатарамі і крэольскімі памешчыкамі індзейцаў, неграў-рабоў, метысаў выклікала масавыя паўстанні. Найбольшым быў рух камунерас у 1781. У ліп. 1810 у Багаце ўспыхнула паўстанне супраць іспан. прыгнёту; створана Рэвалюц. хунта, якая ў 1813 абвясціла незалежнасць краіны. У 1819—30 Новая Гранада ўваходзіла ў федэратыўную рэсп. *Вялікая Калумбія*, пасля распаду якой (1830) створана рэсп. Новая Гранада. З 30-х г. у К. ішла кроваправалітная барацьба за ўладу паміж Кансерватыўнай і Ліберальнай партыямі (васн. ў 30-я г.). У 1863 ліберады абвясцілі федэратыўную рэспубліку — Злучаныя Штаты Калумбіі, а ў 1886 перамаглі кансерватары, К. стала цэнтралізаванай рэспублікай. У К. адбываліся частыя дзярж. перавароты, якія ў значнай меры тлумачыліся барацьбой паміж Англіяй і ЗША за ўплыў на краіну. Каб захапіць зону будучага Панамскага канала, ЗША ў 1903 арганізавалі пераварот у дэпартаменце К.— Панаме. У выніку Панама абвешчана самастойнай дзяржавай. Фактычна яна трапіла ў залежнасць ад ЗША. Пад уплывам Вял. Кастр. сацыяліст. рэв. ў К. пачаўся ўздым рабочага руху (стачкі докераў у 1920, нафтавікоў, рабочых тытунёвых плантацый). 17.7.1930 засн. Камуніст. партыя К. (КПК). За час кіравання ліберадаў (1930—46) пад націскам нар. мас праведзены некат. рэформы (права на забастоўку, аддзяленне царквы ад дзяржавы і інш.). У 1935 устаноўлены дыпламат. адносіны з СССР (у 1943 абмяняліся місіямі). У 2-й сусв. вайне К. выступіла на баку антыгітлер. кааліцыі (у ліст. 1943 аб'явіла вайну Германіі). У 1948 у К. ўспыхнула паўстанне супраць правячых колаў К. і прыгнёту манаполій ЗША, якія шырока праніклі ў эканоміку краіны. Паўстанне было задушана, узмацнілася рэакцыя: у 1948 К. разарвала дыпламат. адносіны з СССР, у 1952 падпісала ваен. пагадненне з ЗША, у 1956 забаронена КПК. 10.5.1957 скінуты дыктатарскі рэжым Густава Рохаса Пінільі (устаноўлены ў 1953). У 1958 ліберады і кансерватары стварылі блок Нацыянальны фронт. У аснову яго пакладзены прынцып роўнага падзелу грамадскіх і дзярж. пасад паміж партыямі і прынцып чаргавання на пасадзе прэзідэнта рэспублікі (праз кожныя 4 гады). У 1957 КПК выйшла з падполля. Унутрыпаліт. становішча ў К. пад кіраўніцтвам Нац. фронту астаецца напружанае. У 1966—67 К. заключыла гандл. дагаворы з сацыяліст. краінамі,


КАЛУМБІЯ
Маштаб 1:15 000 000
150 0 150 300км
КАРЫБСКАЕ МОРА
ВЕНЕСУЭЛА
ЭКВАДОР
ПАНАМА
Санта-Марта
Баранкілья
Картахена
Медэльін
Багата
Калі
Букараманга
Кукута
Сан-Крыстобаль
Маракайба
Кора
Барыса
Трухільё
Валера
Мерыда
Барынас
Каракас
Баркісімета
Акарыгуа
Калабоса
Гуаяна
Сесеаль
Сан-Фелікс
Уакары
Майпурэс
Сан-Педра-дэ-Арыменда
Сан-Хасэ
Сан-Марцін
Каламар
Мірафлорэс
Макаранао
Ла-Дорада
Ла-Чарыра
Эль-Энканто
Пуэрта-Альфонса
Пуэрта-Карэньо
Пуэрта-Каробэда
Пуэрта-Уітота
Пуэрта-Асіс
Пуэрта-Берыо
Пуэрта-Лопес
Пуэрта-Карыньо
Пуэрта-Сантандэр
Пуэрта-ла-Канкордыя
Пуэрта-Сесуда
Пуэрта-Хасэ-дэль-Гуафарэ
Пуэрта-Рэйес
Пуэрта-Сіліа
Пуэрта-Рэал
Пуэрта-Рэал
Пуэрта-Рэал

новейшей истории стран Латинской Америки, М., 1964; Ильина Н. Г. Политическая борьба в Колумбии (1946—1957), М., 1968; Томас А. Б. История Латинской Америки, пер. с англ., М., 1960; Кутейщикова В. Н. Роман Латинской Америки в XX в., М., 1964; Полевой В. М. Искусство стран Латинской Америки, М., 1967.

М. С. Вайтовіч (прырода, насельніцтва, гаспадарка), *А. І. Казлоў* (гістар. нарыс). Мінск; *У. З. Клепікаў* (асвета), *Л. С. Аспанат* (літаратура), *Я. І. Кірычэнка* (архітэктура, выяўленчае мастацтва). Масква.

КАЛУМБУС (Columbus), горад у ЗША, адм. ц. штата Агайо. На р. Саёта (прыток Агайо). Важны прамысл., навук. і трансп. цэнтр. 533,4 тыс. ж. (1970). Буйны цэнтр самалётабудавання; машынабуд. (у т. л. вытв. станкоў, вагонаў, с.-г. машын, абсталявання), металаапр., харч. прамысловасць. Ун-т, ін-т Батэла (вядзе даследаванні па ат. энергіі, фізіцы, хіміі).

КАЛУС, к а л ю с (лац. callus тоўстая скура, мазоль), тканкавае новаўтварэнне ў раслін на паверхні ранення. Узнікае на трэшчынах, у месцах, дзе зрастаюцца прышчэпак з прышчэпаю, і інш. Спрыяе загойванню ран. Утвараецца ўсімі жывымі тканкамі, асабліва *камбіем*.

КАЛХІДСКАЯ НІЗІНА, на З Грузіі, у ніжнім цячэнні р. Рыёні. Цягнецца з З на У каля 100 *км*. Паверхня раўнінная, слаба нахіленая да мора, складзеная з алювіяльных адкладаў Рыёні і інш. рэк. Выш. да 150 *м*. Клімат субтрапічны, вільготны. Глебы на большай ч. балотныя і тарфяна-балотныя, на У жаўтазёмы і чырваназемы. Асушана значная частка К. н. Гідрамеліярацыйныя работы па асваенні тэрыторыі працягваюцца. К. н.— важны раён вырошчвання субтрапічных культур.

Літ.: Грузия, М., 1967 (Советский Союз).

КАЛЧАДАНЫ, агульная назва скопішчаў рудных мінералаў, пераважна сярністых, мыш'яковістых, радзей сурмяністых злучэнняў жалеза, медзі, свінцу, цынку, нікелю і інш. К. называюць і калчаданавыя руды, складзеныя пераважна з сульфідных рудных мінералаў. К.— сыравіна для атрымання сернай кіслаты, комплексныя руды для здабычы медзі, цынку, свінцу, нікелю, а таксама барыту, золата, серабра, радзей мыш'яку, кадмію, селену і інш.

Сярод мінералаў-калчаданаў найб. пашыраны серны К. *(пірыт)*, медны *(халькапірыт)*, магнітны *(пірацін)*, мыш'яковы *(арсенапірыт)*, жалезны *(марказіт)*, алавяны *(станін)* і інш. Крышталізуюцца пераважна ў кубічнай ці рамбічнай сістэме. Колер бронзава-жоўты, латунны, шэры; бляск металічны. Непразрыстыя. Цв. да 7,0. Паходжанне гідратэрмальна-метасаматычнае, вулканагенна-асадкавае, радзей асадкавае. Радовішчы ў СССР, Чылі, Іспаніі, Рэсп. Заір, Канадзе, ЗША, Партугаліі.

Літ.: Смирнов В. И. Геология полезных ископаемых, 2 изд., М., 1969, с. 349—370; Рамдор П. Рудные минералы и их срастания, пер. с нем., М., 1962.

КАЛЧАК Аляксандр Васілевіч (1873, Пецярбург — 7.2.1920), адзін з лідэраў рускай контррэвалюцыі, адмірал (1917). З ліст. 1918 ваенны і марскі міністр т. зв. Сібірскага ўрада ў Омску. Пасля перавароту 18.11.1918, падтрыманага інтэрвентамі, аб'явіў сябе «вярхоўным правіцелем расійскай дзяржавы». На тэр. ад Урала да Уладзівастока К. устанавіў тэрарыст. белагвардзейскі рэжым, т. зв. калчакаўшчыну. Пасля разгрому яго армій (гл. *Грамадзянская вайна і ваенная інтэрвенцыя ў СССР 1918—20*) збег пад ахову белачэхаў, якія перадалі яго эсэра-меншавіцкаму «Палітцэнтру» ў Іркуцку. Калі ў Іркуцку ўлада перайшла да бальшавікоў, К. паводле прыгавору Іркуцкага ваен.-рэвалюц. к-та расстралялі.

Літ.: Папин Л. М. Крах колчаковщины и образование Дальневосточной республики, М., 1957.

КАЛЧАН, футарал для стрэлаў у старажытных воінаў, узброеных лукамі. Насіўся на поясе ззаду справа.

КАЛЫБАНЬ, вёска ў Брагінскім р-не Гомельскай вобл., каля р. Брагінка (1 *км*). Цэнтр сельсавета і калгаса «Ленінскі шлях». За 41 *км* на Пд ад Брагіна, 171 *км* ад Гомеля, 7 *км* ад чыг. ст. Пасудава. 741 ж., двароў 300 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, шавецкая майстэрня, 2 магазіны. У 1943 вёску спалілі нямец.-фаш. захопнікі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

КАЛЫМА, рака ў Магаданскай вобл. і Якуцкай АССР. Даўж. 2129 *км* ад зліцця р. Аян-Юрах і Кулу, 2513 *км* разам з вытокам Кулу—Кеньелічы. Пл. бас. 647 тыс. *км*². Вытокі К. на схілах хр. Сунтар-Хаята і на Верхнекалымскім нагор'і, упадае ва Усх.-Сібірскае мора.

У вярхоўі праразае хр. Чэрскага. У сярэднім цячэнні даліна расшыраецца, рака падзяляецца на рукавы. У нізоўі цячэ па Калымскай нізіне. Гал. прытокі: Каркадон, Амалон, Вял. Анюй (правыя), Ясачная (левы). Жывленне пераважна снегавадажджавое. Ледастаў з пач. кастр. да канца мая—пач. чэрвеня. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 3800 *м*³/*сек*. Прамысл. рыбы: сібірскі асетр, шчупак, харыус, мянтуз. Суднаходная на 2000 *км* ад вусця. На К.— г. Сярэднекалымск; будуецца (1972) Калымская ГЭС. *В. А. Дзяменцьеў*. Мінск.

КАЛЫМАГА, у старажытнай Русі закрыты баярскі або царскі экіпаж без сядзення для фурмана, з высокім кузавам, з суконнымі або шаўковымі фіранкамі па баках. Пазней К. называліся ўсе старадаўнія грувасткія экіпажы, а таксама цяжкія нязграбныя павозкі. На Беларусі К. іранічна называлі калёсы, платформы для перавозкі цяжкіх грузаў, на якіх ездзілі ў гарадах балаголы.

КАЛЫМСКАЯ НІЗІНА, у ніжнім і сярэднім цячэнні р. Калымы і ў бас. р. Алазеі. Выш. да 100 *м*. Паверхня складзена з рыхлых чацвярцічных адкладаў. Забалочана. На К. н. зрэдку трапляюцца невысокія (выш. да 300 *м*) плоскія ўвалы і *гідралакаліты*. Шмат дробных азёраў. Занята лістоўнічным рэдкалессем. Радовішча кам. вугалю.

КАЛЫСКА Павел Лаўрынавіч [н. 29.6(11.7). 1896, в. Кляшчы Кобрынскага пав. Гродзенскай губ.], перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1948). У 1928—56 у саўгасе «Дзесяцігоддзе БССР» Любанскага р-на Мінскай вобл.: рабочы, брыгадзір паляводчай брыгады. Званне Героя Сац. Працы прысвоена за атрыманне высокіх ураджаяў жыта. Жыве ў пас. Сосны Любанскага р-на.

КАЛЫХМАТАЎ Фёдар Антонавіч (н. 1913, в. Стрыжы Салікамскага пав. Пермскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1944. На фронце з 1941, наводчык гарматы. Вызначыўся 2—6.7.1944 у баях на шашы Магілёў—Мінск. Калі ў час варожай контратакі загінула абслуга гарматы, К. адзін вёў бой, знішчыў танк, 2 аўтамашыны. Жыве на радзіме.

КАЛЫШКА Баляслаў Вікенцьевіч [26.7(7.8). 1837, фальварак Карманішкі Лідскага пав. Віленскай губ.— 28.5(9.6).1863], удзельнік рэвалюц. руху 60-х г. 19 ст. З дваран. З 1860 вучыўся ў Маскоўскім ун-це, адзін з кіраўнікоў рэвалюц. студэнцтва, прапагандаваў ідэі рэвалюц. саюзу народаў у барацьбе з самадзяржаўем. Вясной і летам 1861 вёў рэвалюц. агітацыю ў Лідскім пав., увосень удзельнічаў у студэнцкіх хваляваннях у Маскве. У пач. сак. 1863 сфарміраваў паўстанцкі атрад (Дубіскі полк) у Жэмайціі, меў некалькі сутычак з царскімі войскамі, адстойваў інтарэсы сялян. У крас. далучыўся да З. Серакоўскага і камандаваў калонай у паходзе на Пн Літвы. Узяты ў палон і павешаны ў Вільні.

Літ.: Паўстанне ў Літве і Беларусі 1863—1864 гг., М., 1965 (Восстание 1863 г. Материалы и документы). *Г. В. Кісялёў*. Вільнюс.

КАЛЬВАРЫЯ (лац. calva чэрап), у каталікаў Літвы, Польшчы і Беларусі святое месца, куды сцякаліся натоўпы набожных, хворых, калек, старцоў на пакаянне. Пачалі заснаўвацца як апорныя пункты каталіцызму ў 2-й пал. 16 — пач. 17 ст. на ўзгорках і ў лесе, часта на былых язычніцкіх *капішчах*. Найстарэйшая К. каля Вільні засн. ў 1564. У цэнтры звычайна ставілася капліца, будаваўся касцёл або кляштар. Служылі сродкам распальвання рэліг. фанатызму. К. былі ў Мінскім, Барысаўскім, Вілейскім і інш. паветах. У Мінску пад гэтай назвай захаваліся могілкі.

КАЛЬВІН (Calvin) Жан (10.7.1509, Нуаён, Францыя — 27.5.1564), дзеяч Рэфармацыі, заснавальнік *кальвінізму*. З багатай бурж. сям'і. Вывучаў багаслоўе ў Буржы, права ў Парыжы і Арлеане. У 1533 адрокся ад каталіцкай царквы, стварыў першую абшчыну паслядоўнікаў сваіх рэфарматарскіх ідэй. У Швейцарыі апублікаваў твор «Навучанне хрысціянскай веры» (1536), дзе выклаў асновы новага кірунку ў пратэстантызме (кальвінізму). Энергічна праводзіў у жыццё рэфарматарскія ідэі. Стаў на чале новай царк. арганізацыі ў Жэневе, якая фактычна падначаліла свецкую ўладу. Скасаваў пышны каталіцкі культ, увёў строгую рэгламентацыю грамадскага і асабістага жыцця. Праследаваў праціўнікаў свайго вучэння (у 1553 пакараў смерцю іісп. вучонага М. Сервета). Дзейнасць К. спрыяла пашырэнню пратэстантызму ў Еўропе.

КАЛЬВІНІЗМ, разнавіднасць *пратэстантызму*, якая ўзнікла ў перыяд Рэфармацыі ў 16 ст. Як адзначаў Ф. Энгельс, вучэнне Кальвіна аб наканаванні «было рэлігійным выражэннем таго факта, што ў свеце гандлю і канкурэнцыі ўдача або банкруцтва залежаць не ад дзейнасці або майстэрства асобных людзей, а ад абставін, якія ад іх не залежаць» (Маркс К. и Энгельс Ф. Соч., т. 22, с. 308). Заснавальнік Ж. *Кальвін*. Радзіма К.— Жэнева, потым ён пашырыўся ў Францыі, Нідэрландах, Шатландыі, Англіі і інш. краінах.

К. склаўся ў барацьбе супраць каталіцкай царквы, з аднаго боку, і супраць нар. рэфармацыі з яе ідэяй сац. роўнасці — з другога. Ён ажыццявіў прынцып простай і таннай царквы, набажэнства звёў да чытання *Біблii*, пропаведзі — да супольнага спявання псалмоў. Усе таінствы абмежаваў хрышчэннем. Увёў у царкву дэмакр. элемент: кальвінісцкае духавенства (пастары) і царк. кіраўніцтва (прасвітары) выбіраюцца прыхаджанамі. Гал. догмат і адметная рыса К.— ідэя пра безумоўнае наканаванне (бог яшчэ да нараджэння людзей наканаваў адным выратаванне, другім — пагібель). Аднак гэта не выключала актыўнай дзейнасці чалавека. Паводле К., веруючы поспехамі ў асабістым жыцці можа давесці, што ён «божы абраннік». К. апраўдвае існаванне класа выбраных і класа прыгнечаных, бурж. накапленне і бурж. дзейнасць наогул. Імкнучыся прымірыць людзей з капіталіст. ладам, К. тармозіць грамадскі прагрэс. Сучасны К. існуе ў форме рэфарматарства, прасвітарыянства, кангрэгацыяналізму. Асабліва пашыраны ў Швейцарыі, Нідэрландах, Вялікабрытаніі, Шатландыі, ФРГ, ЗША, дзе яго ідэолагі нярэдка выступаюць у духу антыкамунізму. У СССР невял. колькасць прыхільнікаў К. (рэфарматы) ёсць пераважна ў зах. абласцях Украіны. Пашырэнню К. на Беларусі садзейнічала эканам. развіццё гарадоў, узмацненне антыфеад. барацьбы ў іх; імкненне бел. феадалаў адстаяць сваю эканам. і паліт. незалежнасць ад замахаў Польшчы; барацьба шляхты з магнатамі за паліт. правы; спробы феадалаў і гараджан абмежаваць прывілеі духавенства і ўплыў Ватыкана, стварыць незалежную царкву. У 50-я г. 16 ст. ўзнікаюць кальвінісцкія абшчыны ў Вільні, Брэсце, Нясвіжы, Клецку і інш. гарадах. Да 60-х г. 16 ст. К. прымае большая частка бел. і літ. магнатаў (Сапегі, Кішкі, Хадкевічы, Тышкевічы, Саламярэцкія, Дарагастайскія і інш.), значная частка шляхты. У 2-й пал. 16 — пач. 17 ст. пры актыўным удзеле гараджан узнікаюць кальвінісцкія абшчыны ў Віцебску, Мінску, Полацку, Оршы, Глыбокім, Заслаўі, Іўі, Любчы, Ляхавічах, Навагрудку, Смаргоні і інш. Пры абшчынах будуюцца цэрквы, школы (гл. *Кальвінісцкія школы*), друкарні, шпіталі. Існавала 6 кальвінісцкіх дыстрыктаў (Віленскі, Завілейскі, Навагрудскі, Рускі, Брэсцкі, Жмудскі). У 1563 феадалы-кальвіністы прывілеем караля ўраўнаваныя ў правах з католікамі і праваслаўнымі. У 1599 паміж кальвіністамі і праваслаўнымі ў Вільні заключана канфедэрацыя для абароны ад наступлення контррэфармацыі. У 17 ст. большая частка феадалаў-кальвіністаў перайшла ў каталіцызм, колькасць кальвінісцкіх абшчын рэзка паменшала, аднак некаторыя асталіся да 20 ст.

Літ.: Энгельс Ф. Крестьянская война в Германии, Маркс К. и Энгельс Ф. Соч., т. 7; яго ж. Введение к английскому изданию «Развития социализма от утопии к науке», Маркс К. и Энгельс Ф. Соч., т. 22; Капелюш Ф. Религия раннего капитализма, М., 1931; Поршнев Б. Ф. Кальвин и кальвинизм, у кн.: Вопросы истории религии и атеизма, в. 6, М., 1958; Подокшин С. А. Реформация и общественная мысль Белоруссии и Литвы, Мн., 1970.

В. А. Малахаў, С. А. Падокшын (кальвінізм на Беларусі). Мінск.

КАЛЬВІНІСЦКІЯ ШКОЛЫ, пратэстанцкія навучальныя ўстановы, якія ствараліся бел. магнатамі, шляхтаю, гараджанамі — прыхільнікамі *кальвінізму*. У 2-й пал. 16 — пач. 17 ст. існавалі ў Вільні, Віцебску, Галоўчыне, Гарадзеі, Глыбокім, Жупранах, Заслаўі, Івянцы, Іўі, Капылі, Койданаве, Любчы, Мінску, Навагрудку, Оршы, Полацку, Слуцку, Смаргоні, Шыдлове і інш.

Асн. ўвага ў К. ш. аддавалася рэліг. навучанню і выхаванню, але значнае месца адводзілася і свецкім навукам. Апрача багаслоўя, вывучаліся старагрэч., лац., бел., польская мовы, рыторыка, гісторыя, матэматыка, антычная паэзія, царкоўныя спевы і інш. Бел. мову вучылі па «Катэхізісе» (школьны падручнік на бел. мове, выдадзены С. Будным, Л. Крышкоўскім і М. Кавячынскім у Нясвіжы ў 1562). Тэрмін навучання ў К. ш. 6—10 гадоў. Перадавыя настаўнікі К. ш. Беларусі

карысталіся гуманіст. метадамі навучання. Выпускнікі паасобных К. ш. атрымлівалі веды, дастаткова выя, каб паступіць ва ун-ты. У пач. 17 ст. ў сувязі з наступленнем контррэфармацыі колькасць К. ш. паменшылася.

Літ.: Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі, Мн., 1968, с. 17—23.
С. А. Падокшын. Мінск.

КАЛЬВІНСКІ ЗБОР, тып рэфармацкага храма абароннага характару. Пашыраны на Беларусі ў 16 ст. К. з. сумяшчалі рысы готыкі (стромкія дахі, стральчатыя байніцы, гранёныя апсіды, контрфорсы) і Рэнесанса (цыліндрычныя скляпенні, атыкі, расчлянёныя фасады), мелі абаронныя прыстасаванні (часам абкружаліся крапаснымі мураванымі сценамі з вежамі, земляными валамі і равамі; сцены К. з. і званіц рабіліся тоўстыя, праразаліся байніцамі).





Кальвінскія зборы: уверсе — Койданаўскі (агульны выгляд; здымак пач. 20 ст.), унізе злева — Смаргонскі (план) і справа — Асташынскі (план).

Сярод К. з.: храмы ў Койданаве (1-я пал. 16 ст.; 3-нефавы, зальны, з гранёнымі хорамі, магутнай вежай у тарцы над уваходам; пастаўлены на месцы замка, абнесены сцяной з 9 вежамі; не збярогся), у Асташыне (2-я пал. 16 ст.; зальны, з алтаром, з 3-пруснай вежай, якая прылягала да гал. фасада; не збярогся), у Смаргоні (1553; у плане выцягнуты васьмівугольнік, з сферычным купалам, закрытым знадворку высокім атыкам, і вежай, квадратнай у аснове і васьмігранай уверсе). Гл. таксама *Заслаўская Спаса-Праабражэнская царква.*

Літ.: Всеобщая история архитектуры, т. 6, М., 1968, с. 467—468; Чантурия В. А. История архитектуры Белоруссии, Мн., 1969, с. 67—70.

КАЛЬДЭРОН ДЭ ЛА БАРКА (Calderón de la Barca; поўнае прозв. Кальдэрон дэ ла Барка Энао дэ ла Барэда-і-Рыяньё) Педра (17.1.1600, Мадрыд — 25.5.1681), іспанскі драматург. Са збяднелага арыстакр. роду. Вучыўся на юрыста ва ун-це г. Саламанкі. У 1651 прыняў духоўны сан. Быў блізкі да каралеўскага двара. Раннія творы, напісаныя пад уплывам рэаліст. драматургіі Лопэ дэ Вэгі, вызначаюцца гуманіст. зместам («Каханне, гонар і ўлада», 1623, выд. 1637; «Кахаць і паслядзі смерці», 1633, выд. 1677; і інш.). У філасофска-сімвалічнай драме «Жыццё — гэта сон» (1631—32, выд. 1636) выяўлены рэакц. рысы светапогляду К. дэ ла Б., абумоўленыя ўплывам феад.-каталіцкай ідэалогіі: песіміст. погляд на чалавека, містыцызм. У п'есах рэліг. характару прапагандаваў каталіцызм («Пакланенне крыжу», 1630—32, выд. 1636; «Чысцец святога Патрыка», 1634, выд. 1636; і інш.). Асобнае месца займае драма «Саламейскі алькальд» (1640—45, выд. 1651), у якой, нягледзячы на манарх. перакананні К. дэ ла Б., востра выкрываецца самавольства іісп. феадалаў, з вялікай маст. сілай паказана барацьба простага селяніна супраць дваранінагвалтаўніка. Творчасці К. дэ ла Б. ўласцівы вытанчаная верш. тэхніка, ускладненая метафарычнасць і алегарызм. Т-р імя Я. Купалы паставіў п'есу «Вясковы суддзя» (1925); т-р імя Я. Коласа — «Дама-невідзімка» (1956) і «Каханне не жарты» (1966); Бел. рэсп. т-р юнага гледача — «Дама-невідзімка» (1964).



Тв.: Рус. пер.— Пьесы, т. 1—2, М., 1961.

КАЛЬКА (франц. calque), празрыстая папера ці тканіна, на якой робяць чарцёж, прызначаны для вырабу з яго святлокопій.

К. для капіравання чарцяжа тушшу — каландраваная папера (гл. *Каландр*) ці тонкая тканіна, апрацаваная спец. рэчывамі; К. для чарчэння алоўкам — некаландраваная папера. Іншы раз К. называюць сам чарцёж, зроблены на кальцы.

КАЛЬКУЛЯЦЫЯ (лац. calculatio разлік, вылічэнне), вызначэнне памеру затрат на адзінку прадукцыі або на аб'ём выкананых работ па асобных відах гэтых затрат у грашовым вылічэнні.

Адрозніваюць К. планавую, нарматыўную і справаздачную. Планавая характарызуе сярэдні ўзровень выдаткаў на вытворчасць прадукцыі ў запланаваным перыядзе. Складаецца на аснове прагрэс. нормаў выт. спажывання сыравіны і матэрыялаў, працы і заработнай платы, расходаў на ўтрыманне і абслугоўванне і г. д. Нарматыўная — разлік сабекошту вырабаў паводле нормаў расходаў сродкаў вытворчасці і на аплату працы на пэўную дату. Выкарыстоўваецца для планавання і вылічэння справаздачнага сабекошту прадукцыі, эканам. ацэнкі эфектыўнасці арганізацыйна-тэхн. мерапрыемстваў. Справаздачная — разлік фактычнага сабекошту гатовай прадукцыі. Складаецца паводле звестак бухгалтарскага ўліку вробленых затрат. Выкарыстоўваецца для ацэнкі вынікаў гасп. дзейнасці, вызначэння рэнтабельнасці прадукцыі, для кантролю за зніжэннем яе сабекошту. Планавай і справаздачнай К. карыстаюцца пры вызначэнні цэн на прадукцыю.

Літ.: Чумаченко Н. Г. Методы учета и калькулирования себестоимости промышленной продукции, М., 1965; Басманов И. А. Теоретические основы учета затрат на производство и калькулирования себестоимости промышленной продукции, [М.], 1970.
І. А. Басманаў. Мінск.

КАЛЬКУТА (Калката), горад у Індыі, адм. ц. штата Зах. Бенгалія. Размешчаны ў дэльце Ганга — Брахмапутры, на левым беразе Хуглі (рукаў Ганга). Вузел чыг. і шашэйных дарог, рачны порт (даступны акіянскім суднам), аэрапорт у прыгарадзе Дум-Дум. Важны гандл.-фінансавы (1-е месца ў Індыі па экспарце), прамысл. і культурны цэнтр. 3,1 млн. ж. (1969). Джутавая, баваўняная, металаапр., маш.-буд. (у т. л. аўтамабілебуд.), хім., папяровая, суднабуд., палігр. прамысловасць. Ун-т (з 1857), нац. б-ка, бат. сад.

Горад вырас з факторыі і форта Уільям, засн. англ. Ост-Індскай кампаніяй у 1690—91. Назва паходзіць ад в. Калігхат, далучанай ў 1698 да форта. Пасля таго як Ост-Індская кампанія захапіла Бенгалію (1757), К. стала пунктам, адкуль каланізатары адпраўлялі тавары ў Англію. З 1773 фактычна сталіца англ. уладанняў у Індыі, у 1854 стала ёю юрыдычна (да 1911, калі сталіца Індыі перанесена ў Дэлі).

КАЛЬМАН (Kálmán) Імрэ (24.10.1882, в. Шыяфак — 30.10.1953), венгерскі кампазітар. Разам з Ф. Легарам стваральнік і гал. прадстаўнік т. зв. новавенскай аперэты (гл. *Аперэта*). Эміграваў з Аўстрыі пасля захопу яе нім. фашыстамі (1938). З 20 аперэт К. найб. вядомыя: «Княгіня чардаша» («Сільва»; паст. 1915, у Магілёўскім абл. т-ры муз. камедыі 1963, у Дзярж. т-ры муз. камедыі БССР 1972), «Баядэра» (паст. 1921, у Дзярж. т-ры муз. камедыі БССР 1971), «Графіня Марыца» (паст. 1924), «Прынцэса цырка» (паст. 1926), «Фіялка Манмартра» (паст. 1930, у Дзярж. т-ры муз. камедыі БССР 1971).

КАЛЬМАРСКАЯ УНІЯ 1397—1523, аб'яднанне Даніі, Нарвегіі (з Ісландыяй) і Швецыі (з Фінляндыяй) пад уладай дацкіх каралёў. Канчаткова аформлена ў 1397 у г. Кальмар (Швецыя), дзе каралём трох дзяржаў каранаваўся сваяк каралевы Маргарыты Дацкай Эрык Памеранскі.

К. у.— вынік шэрагу эканам. і паліт. прычын. У ёй былі зацікаўлены буйныя феадалы, якія мелі маёнткі і лены ва ўсіх трох каралеўствах, гандл. гарады. К. у. павінна была процістаяць нім. эканам. і паліт. экспансіі. Была петрывалая. Эканам. і паліт. ўціск Даніі выклікаў нездавальненне і пратэст сялянства і гараджан Швецыі і Нарвегіі, гэта прывяло да паўстанняў і паасобных войнаў. У 1523 Швецыя стала незалежнай і К. у. ліквідавана. Нарвегія ў 1537 абвешчана правінцыяй Даніі (да 1814).

КАЛЬМАРЫ, марскія галаваногія *малюскі.*

КАЛЬНІЦА (Дзервяніска), возера ў бас. Котры, у Гродзенскім р-не. Пл. 1,04 *км*². Даўж. 2,8 *км*, найб. шыр. 0,42 *км*, сярэдняя 0,37 *км*. Катлавіна выцягнута з Пн на Пд. Вадазбор плоскі, забалочаны, паўн.-зах. частка ўкрыта лесам. Водзяцца плотка, акунь, шчупак.

КАЛЬРАБІ (Brassica caulorapa), двухгадовая агароднінная расліна роду *капусты.*

На 1-м годзе развівае кароткае сцябло, якое разрастаецца і ўтварае круглы, пласкакруглы ці авальны сцеблаплод — клубнепадобнае мясістае патаўшчэнне, дзе назапашваюцца пажыўныя рэчывы. У дыяметры К. дасягаюць 30—110 *см*. Лісце лопасцевае, зубчастае на прадаўгаватых чаранках, спіральна размешчанае на сцеблаплодзе. На 2-м годзе жыцця расліна ўтварае тонкія галінкі і цвіце. Мае шмат цукроў і вітаміну С. Спажываецца сцеблаплод гатаваны або сыры. На Беларусі раянаваны скараспелы сорт Венская белая 1350. Іл. гл. ў арт. *Капуста.*

КАЛЬЦАВАННЕ ПТУШАК, гл. ў арт. *Мечанне жывёл.*

КАЛЬЦАВАЯ ГНІЛЬ, хвароба бульбы, якая выклікаецца бактэрыяй Corynebacterium sepedonicum. Выяўляецца ў формах завядання, кальцавой і ямкавай гнілі. Зніжае ўраджай, пагаршае ўлежнасць і таварныя якасці бульбы; асабліва небяспечная насенным участкам.

У хворых раслін у час цвіцення і пазней пачынае вянуць лісце, потым сцяблы і ўся расліна. На зрэзе хворых сцяблоў відаць пацямнелыя сасуды, на разрэзе клубняў — крэмавае, жоўтае або карычневае кольца пашкоджаных сасудаў, пры націсканні на якія выдзяляецца слізь. Ямкавая гніль развіваецца пад скуркай клубняў (круглаватыя жоўтыя плямы) у сховішчах. Інфекцыя перадаецца хворымі клубнямі ў час уборкі, транспартавання, хавання і пры рэзанні пасадачнага матэрыялу. Меры барацьбы: двух-, трохразовая бракоўка хворых раслін з выдаленнем заражанага бацвіння з клубнямі, прасушка клубняў на святле, пасадка цэлымі клубнямі.

Літ.: Дорожкин Н. А. Болезни картофеля, Мн., 1955.
А. С. Шуканаў. Мінск.

КАЛЬЦАТЫ Аркадзь Мікалаевіч [н. 1(14).9.1905, Пецярбург], рускі савецкі кінааператар. Засл. арт. БССР (1935). У 1927—35 на кінастудыі «Савецкая Беларусь». Удзельнічаў у здымках фільмаў «Джэнтльмен і певень», «Хвоі гамоняць» (1929). Аператар бел. фільмаў «Рубікон» (1931), «Ураган» (1932), «Гонар свету» (1933), «Першы ўзвод» (1933, з Б. Рабавым), «Паручнік Кіжэ» (1934), «Шлях карабля» (1935, з Е. Менгдэнам і М. Тэйтэльбаўмам). Фільмы на інш. кінастудыях: «Дзеці капітана Гранта» (1936), «Вялікі грамадзянін» (1938—39), «Музычная гісторыя» (1940), «Тарас Шаўчэнка» (1951, з Д. Даляцкім і І. Шэкерам), «Карнавальная ноч» (1956). З 1963 выступае як рэжысёр. Дзярж. прэміі СССР 1946, 1951, 1952. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга.

КАЛЬЦОЎ Аляксей Васілевіч [3(15).10.1809, Варонеж — 29.10(10.11).1842], рускі паэт. З сям'і гандляра. Друкавацца пачаў у 1831. Першая кн. вершаў выйшла ў 1835. Асабістае знаёмства з А. Пушкіным, дружба з В. Бялінскім зрабілі ўплыў на фарміраванне ідэйнамаст. поглядаў К. Ужо ў ранніх вершах (1825—30), напісаных у духу сентымент.-рамант. паэзіі, паявіліся рэаліст. рысы («Падарожны», «Начлег чумакоў»). Вяршыня творчасці К.— песні, створаныя ў найлепшых традыцыях рус. фальклору; многія сталі нар. песнямі. Асн. тэма творчасці К.— жыццё сялянства. Апяваў працу земляроба і харство роднай прыроды («Песня аратага», «Ураджай», «Касец» і інш.), апавядаў пра цяжкі лёс беднаты («Горкая доля», «Гора», «Доля беднякa» і інш.), пра імкненне нар. мас да лепшай долі, пра іх пратэст супраць прыгонніцтва («Дума сокала», «Лес» і інш.). Паэзія К. вызначаецца рэалізмам і народнасцю, глыбокім лірызмам і шчырасцю, выразнасцю і афарыстычнасцю паэт. мовы, рытміка-інтанацыйным багаццем.



Тв.: Полн. собр. стихотворений, 2 изд., Л., 1958; Соч., т. 1—2, М., 1961; Соч., М., 1966.
Літ.: Белинский В. Г. Полн. собр. соч., т. 9, М., 1955; Добролюбов Н. А. Собр. соч., т. 1, М.— Л., 1961; Салтыков-Щедрин М. Е. Собр.

соч., т. 5, М., 1966; Топков В., А. В. Кольцов, Воронеж, 1958.

КАЛЬЦОЎ Мікалай Канстанцінавіч [3(15).7.1872, Масква — 2.12.1940], савецкі біёлаг, заснавальнік школы эксперыментальнай біялогіі ў СССР. Акад. УАСГНІЛ (1935), чл.-кар. АН СССР (1916). Скончыў Маскоўскі ун-т (1894). У 1903—18 праф. Вышэйшых жаночых курсаў, у 1917—39 дырэктар Ін-та эксперым. біялогіі. Абгрунтаваў палажэнне пра фактары, якія вызначаюць форму клетак («прынцып Кальцова»). Шэраг прац К. па фіз.-хім. фактарах, якія ўплываюць на клеткі і аднаклетачныя арганізмы, па праблеме штучнага партэнагенезу, спадчынных уласцівасцях крыві, рэгуляванні суадносін полаў, ролі генаў у фізіялогіі развіцця. У 1916 прадказаў магчымасць штучна выклікаць мутацыі і арганізаваў першыя даследаванні па радыяцыйным (1920—21) і хімічным мутагенезе (1932—34). Распрацаваў асн. палажэнні сучаснай малекулярнай біялогіі: уяўленне пра малекулярную структуру храмасомаў і генаў, абгрунтаваў прынцып стварэння новых спадчынных малекул.

Тв.: Исследования о спермиях десятиногих раков..., М., 1905; О наследственных химических свойствах крови, М., 1924; Организация клетки, М.— Л., 1936; Физико-химические основы морфологии.— Наследственные молекулы, у зб.: Классики советской генетики, Л., 1968.

Літ.: Полынин В. М. Пророк в своем отечестве, М., 1969; Астауров Б. Л. Памяти Николая Константиновича Кольцова, «Природа», 1941, № 5. *П. Ф. Ракіцкі.* Мінск.

КАЛЬЦОЎ Міхаіл Яўхімавіч [31.5(12.6).1898, Кіеў — 4.4.1942], рускі савецкі пісьменнік, журналіст. Чл.-кар. АН СССР (1938). Чл. КПСС з 1918. З сям'і рамесніка. Удзельнік Лютаўскай і Кастр. рэв. 1917 у Петраградзе, гераічнай барацьбы ісп. народа супраць фашызму 1936—39. З 1922 супрацоўнік, з 1923 чл. рэдкалегіі газ. «Правда». Заснавальнік і першы рэдактар час. «Огонек» (1923—38), рэдактар час. «Чудак» (1928—30), «Крокодил» (1934—38), «За рубежом» (з М. Горкім). Друкавацца пачаў у 1920. Майстар фельетона, пабудаванага на рэаліст. дакладнасці факта, з ярка намаляваным вобразам. Аўтар кн. «Іспанскі дзённік» (1938, незакончаная), нарысаў пра У. І. Леніна («Апошні рэйс», 1924; «Студзеньскія дні», 1925), на міжнар. тэмы («18 гарадоў»). Талент сатырыка асабліва раскрыўся ў серыі навел «Іван Вадзімавіч, чалавек на ўзроўні» (1933). Творы К. спалучаюць пафас і лірызм, патэтыку і іронію. Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі.

Тв.: Избр. произв., т. 1—3, М., 1957.

Літ.: Михаил Кольцов, каким он был, М., 1965; Рубашкин А. Михаил Кольцов, Л., 1971; Русские советские писатели-прозаики. Биобиблиогр. указатель, т. 2, Л., 1964. *Н. В. Галаўко.* Мінск.

КАЛЬЦІЙ (Calcium), Ca, хім. элемент II групы перыяд. сістэмы Мендзялеева. Ат. н. 20, ат. м. 40,08. Належыць да *шчолачназямельных металаў*. Упершыню атрыманы ў 1808. К. ў зямной кары 2,96% па масе.

Прыродны К.— сумесь 6 ізатопаў з масавымі лікамі 40 (96,97%), 42—44, 46 і 48. Сустракаецца толькі ў злучэннях: *вапняк, мармур, мел, даламіт, гіпс, ангідрыт, флюарыт* і *фасфарыты*. Злучэнні К. надаюць жорсткасць прыродным водам. К.— серабрыста-белы метал, *t* пл. 851 °С, *t* кіп. 1482 °С; шчыльн. 1550 *кг/м*³. Хімічна вельмі актыўны, добры аднаўляльнік. На паветры ўкрываецца плёнкай гідраокісу, таму захоўваюць яго ў герметычных сасудах. У злучэннях К. заўсёды двухвалентны. Рэагуе з к-тамі і вадою, бурна выдзяляючы водарод. Пры награванні ўзаемадзейнічае з неметаламі, з многімі металамі ўтварае *інтэрметалічныя злучэнні*, а на паветры згарае і дае нягашаную вапну.

Атрымліваюць з расплаўленых хларыдаў электролізам ці аднаўленнем вокісу К. Выкарыстоўваюць у металургіі, медыцыне, для ачысткі і абязводжвання розных рэчываў. К. і яго злучэнні ўжываюцца ў вытворчасці мінер. угнаенняў, буд. матэрыялаў, шкла, карбіду кальцыю. Гл. таксама *Кальцыт, Апатыт.*

Літ.: Некрасов Б. В. Основы общей химии, т. 2, 2 изд., М., 1969; Доронин Н. А. Металлургия кальция, М., 1959. *А. У. Карызна.* Мінск.

КАЛЬЦЫТ (вапняковы шпат), мінерал класа карбанатаў $CaCO_3$. Галоўны пародаўтваральны мінерал *мелу, вапняку, мармуру*.

Часта змяшчае прымесі Mg, Fe, Mn, часам Zn, Sr. Крышталізуецца ў трыганальнай сістэме. Форма крышталяў таблітчастая, ромбаэдрычная, пласцінчатая і інш. Трапляецца звычайна ў зярністых, зямлістых, валакністых агрэгатах, напечных формах (сталактыты, сталагміты і інш.). Колер шаравата-белы з рознымі адценнямі. Празрыстая бясколерная разнавіднасць — ісландскі шпат. Бляск шкляны. Цв. 3; шчыльн. 2600—2800 *кг/м*³. Крохкі. Паходжанне — арганічнае, хім. асаджэнне ў водаёмах, гідратэрмальнае, метамарфічнае, радзей — магматычнае (гл. *Карбанаты*). Радовішчы ў СССР (Усх. Сібір, Сярэдняя Азія, Закаўказзе і інш.), Ісландыі, Францыі, ЗША.

КАЛЬЦЫФЕРОЛ ($C_{22}H_{44}O$), эргакальцыферол, вітамін D_2, антырахітны вітамін. Атрымліваюць пры апрамяненні эргастэрыну ультрафіялетавымі прамянямі. Мае вял. значэнне ў працэсах косцеўтварэння. Выкарыстоўваецца ў медыцыне і заатэхніі для лячэння і папярэджання *рахіту*.

Літ.: Гл. пры арт. *Вітаміны.*

КАЛЬЧАЦЫ, тып беспазваночных жывёл. Гл. *Кольчатыя чэрві.*

КАЛЬЧУГА, ахоўнае адзенне з прасунутых адно ў адно жал. кольцаў, якое засцерагала воіна ад паражэння халоднай зброяй.

К. была з рукавамі і без іх, доўгая і кароткая. Паявілася ў Асірыі ў жал. веку, пашырылася ў Сарматыі і краінах Усходу. У Зах. Еўропу прынікла пасля крыжовых паходаў (12 ст.). На Русі вядома па раскопках курганоў 10 ст. Цікавая К. 16 ст. знойдзена ў Оршы. На яе кольцах больш за 1000 надпісаў, сярод іх імя ўладальніка І. Выракава. К. знікла ў 17 ст. ў сувязі з пашырэннем агнястрэльнай зброі. Іл. гл. ў арт. *Засцерагальная зброя.*

КАЛЬЧУНЫ, вёска ў Ашмянскім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 7 *км* на ПдЗ ад Ашмяны, 227 *км* ад Гродна, 26 *км* ад чыг. ст. Ашмяны, на аўтамаб. дарозе, якая злучае вёску з Ашмянамі. 447 ж., гасп. 141 (1971). Торфабрыкетны з-д. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячыя яслі-сад, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, сталовая, магазін. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

КАЛЮВІЙ (ад лац. colluvio скопішча), абломкавы матэрыял, які намножыўся каля падножжаў гор ці на іх схілах, калі стромкія берагоў рэк і яроў у выніку руху з верхніх участкаў пад дзеяннем сілы цяжару.

КАЛЮГА Лукаш (сапр. Вашына Канстанцін Пятровіч; 27.9.1909, в. Скварцы Мінскага пав.— 2.10.1937), беларускі савецкі пісьменнік.

З сялян. Скончыў Беларускі пед. тэхнікум (1931). Працаваў у НДІ прамысловасці ВСНГ і на Бел. радыё (да 1933). Друкавацца пачаў у 1927. Аповесць «Ні госць, ні гаспадар» (1928) пра фарміраванне сацыяліст. свядомасці вясковай моладзі. К.— бытапісальнік бел. вёскі. Большасці апавяданняў і аповесці «Ядоля Заблоцкіх» (ч. I — «Прыгоды і летуценні», 1931) характэрныя спалучэнне эстэтызацыі сялянскага побыту, услаўленне працы хлебароба з сатыр. выкрыццём перажыткаў старога. Пераклі на бел. мову аповесць П. Панча «Блакітныя эшалоны» (1930, з К. Чорным), раман Ю. Алешы «Зайздрасць» (1931), «Прыгоды ўдалага ваякі Швейка» (ч. 4, 1932) Я. Гашака.

Літ.: Гальшанаў А. Лукаш Калюга, «Беларусь», 1969, № 9. *Дз. І. Гальмакоў.* Мінск.

КАЛЯДА Анатоль Мацвеевіч [н. 28.2(13.3).1905, в. Шышчыцы Слуцкага пав. Мінскай губ.], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Мінскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1932. З 1931 на сав. рабоце ў Грэскім р-не. У партызанах з жн. 1942 — камандзір аддзялення, узвода, атрада, камісар атрада; з 27.9.1943 камандзір *партызанскай брыгады імя А. В. Суворава* Мінскай вобл. Пасля вайны старшыня Грэскага райвыканкома, заг. аддзела Бабруйскага аблвыканкома, старшыня калгаса ў Кіраўскім р-не. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі. Жыве ў Бабруйску.

КАЛЯДА Эдуард Сцяпанавіч (н. 12.9.1922, в. Занямонь Навагрудскага пав. і ваяводства), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1949. Удзельнік Айч. вайны. З 1955 у калгасе імя Шчорса Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл., з 1962 заг. вытв. ўчастка. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Айч. Вайны 2-й ступені, медалямі.

КАЛЯДАВАННЕ, народны традыцыйны звычай на *каляды* хадзіць па хатах і віншаваць гаспадароў. Суправаджалася выкананнем велічальных песень, тэатралізаваных сцэнак, пераапрананнем у казу, мядзведзя, кабылу, жорава. У аснове яго — стараж. абраднасць, прызначэнне якой — магічным дзеяннем і словам паскорыць надыход цяпла (ад каляд сонца паварочвала на лета) і забяспечыць добры ўраджай у новым гасп. годзе. З часам К. набыло характар забавы.

Літ.: Гл. пры арт. *Калядныя песні.*

КАЛЯДЗІЧЫ, чыг. ст. на лініі Мінск — Асіповічы, вёска ў Сеніцкім с/с Мінскага р-на. За 9 *км* на Пд ад Мінска. 411 ж., гасп. 112 (1971). Магазін. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў Айч. вайны.

КАЛЯДЗІЧЫ, вёска ў Хараўскім с/с Пружанскага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр калгаса «Світанне». За 10 *км* на ПнУ ад Пружан, 106 *км* ад Брэста, 22 *км* ад чыг. ст. Арапчыцы, на аўтамаб. дарозе Пружаны — г. п. Ружаны. 622 ж., гасп. 186 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка. Сяляне-лесарубы К. прымалі ўдзел у забастоўцы ў Ружанскай пушчы (1932—33).

КАЛЯДКА Лукаш Сямёнавіч [19(31).10.1887, в. Лесуны Слуцкага пав. Мінскай губ.— 16.5.1966], генерал-маёр інтэнданцкай службы (1940), удзельнік грамадз. вайны. З сялян. Вучыўся ў Маладзечанскай настаўніцкай семінарыі (1904—07). У рэвалюцыю 1905—07 кіраваў 3-месячнай забастоўкай студэнтаў семінарыі, распаўсюджваў паліт. л-ру, наладжваў сувязі з арг-цыямі РСДРП у Мінску і Смаргоні, за гэта зняволены ў Слуцкай турме. З 1910 у арміі. Удзельнік Лют. і Кастр. рэвалюцый: чл. Савета салдацкіх дэп. 12-й арміі (сак.— май 1917, Рыга), чл. выканкома Усерас. Савета сялянскіх дэп. (май — кастр. 1917, Петраград). З снеж. 1918 у Чырв. Арміі, удзельнік баёў на Паўд. фронце. У 1921—22 ад'ютант М. В. Фрунзе ў Турцыі, потым (да 1952) у Наркамаце абароны СССР. Узнаг. ордэнам Леніна, 5 інш. ордэнамі, медалямі.

Г. А. Каханоўскі. Маладзечна.

КАЛЯДНЫЯ ПЕСНІ (калядкі), жанр, які ўваходзіць у зімовы цыкл каляндарна-абрадавага фальклору. Спяваюцца з 6 на 7 студзеня пры *калядаванні* — традыц. абходзе калядніка дваро ў аднавяскоўцаў. На Беларусі асабліва пашыраны ў паўд. і цэнтр. раёнах. Сінкрэтычна звязаны з нар. гульнямі і тэатралізаванымі паказамі пераапранутых. Грамадска-бытавая функцыя К. п. вызначыла іх святочны ці гульліва-гумарыст. настрой.

Паводле аместу К. п.— велічальнае віншаванне гаспадара ці гаспадыні хаты, пажаданні ім дабра і заможнасці або высмейванне чалавечых хібаў, дабрадушныя кпінкі над жаніхом-малалеткам, дзедам ці старою. Святыя, імёны якіх пад націскам царквы прыстасоўваліся да нар. календара, набываюць у іх звычайныя чалавечыя рысы. У паэт. тэкстах некат. К. п. выступаюць гістар. матывы, чуткі адгалоскі войнаў з туркамі, татарамі і інш. Калядным песням характэрны рэфрэн, слоўныя прыгаворы перад спяваннем песні (запытанне дазволу спяваць) і пасля яго (падзяка за падарунак). Напевы К. п. тыпалагічна акрэсленыя і надзвычай устойлівыя; найчасцей яны квінтовыя з дакладнаю структураю і характэрнай калядкай рытмаформулай. Гучанне малаўнічае з-за багатых тэмбравых зрухаў і розных гукапераймальных прыёмаў, абумоўленых сувяззю з тэатралізаванай гульнёй. Да К. п. вельмі блізкія шчадроўкі, якія спяваюць пад Новы год (па старым стылі) таксама пры традыц. абходзе дваро. Доўгі час К. п. і сам звычай калядавання праследаваліся царкоўнікамі як паганскія па сваіх вытоках і сутнасці, але яны ўсё ж абаранліся ў побыце вёскі і дайшлі да нашага часу як вясёлая карнавальная гульня, якая нагадвае веснавы абрад валачобнікаў на поўначы Беларусі.

Публ.: Шейн П. В. Белорусские народные песни..., СПб., 1874, с. 38—75; Ягo ж. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края, т. 1, ч. 1, СПб., 1887, с. 37—115; Романов Е. Белорусский сборник, в. 8, Вильна, 1912, с. 68—142; Беларускія народныя песні. Запіс Р. Шырмы, т. 3, Мн., 1962; Анталогія беларускай народнай песні, Мн., 1968 (№ 1—10).

Літ.: Карский Е. Ф. Белорусы, т. 3, в. 1, М., 1916, с. 97—141; Бессонов П. Белорусские песни..., М., 1871, с. 87—138; Беларуская народная вуснапаэтычная творчасць, Мн., 1967; Можейко З. Я. Коляда в белорусском полесском селе, «Советская этнография», 1969, № 3; Ле ж. Там, дзе жыве песня, «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі», 1970, № 2. *З. Я. Мажэйка.* Мінск.

КАЛЯДЫ (ад лац. Calendae календы — назва першага дня кожнага месяца ў рымлян), нар. зімовае свята дахрысціянскага паходжання ў беларусаў і інш. славянскіх і неславянскіх народаў. У гадавым крузе нар. аграрных абрадаў і святкаванняў храналагічна займалі першае месца.

Царква дастасавала да стараж. К. святы нараджэння Хрыста і вадохрышча, таму за К. замацава-

ваўся перыяд з 24 снежня да 6 студзеня с. ст. К. характэрны абрадавыя вячоры — *куцця*, якія спраўляліся перад першым днём свята (посная, вялікая куцця), перад Новым годам (багатая, шчодрая куцця) і перад вадохрышчам (посная, галодная, вадзяная куцця). Абавязковаю стравою з'яўлялася ўласна куцця — ячная каша. К. суправаджаліся варажбою, *калядаваннем*, забавамі.

Літ.: Гл. пры арт. *Калядныя песні*.

А. І. Гурскі. Мінск.

КАЛЯНДАР (лац. calendarium літар. пазыковая кніжка; у Ст. Рыме даўжнік плаціў працэнты ў першы дзень кожнага месяца, г. зн. у календы), сістэма злічэння працяглых прамежкаў часу, якая выкарыстоўвае перыядычныя з'явы прыроды: вярчэнне Зямлі вакол Сонца і вакол уласнай восі, рух Месяца вакол Зямлі. Імкненне ўзгадніць паміж сабою гэтыя тры з'явы прывялі ў розных народаў да стварэння трох тыпаў К.: месячнага, месячна-сонечнага і сонечнага.

У месячным К. працягласць *месяца* (сінадычнага, роўнага 29,5306 сутак) звязваецца са зменаю квадраў Месяца. Прыклад такога К.— мусульманскі К., які быў прыняты ў некат. народаў краін Азіі і Афрыкі. У гэтым К. год (354 дні) падзяляецца на 12 месяцаў, працягласцю папераменна 30 і 29 сутак. У месячна-сонечным К. змена квадраў Месяца ўзгадняецца з гадавым рухам Сонца; 19 сонечных гадоў складаюць 235 сінадычных месяцаў. Гэтым К. выкарыстоўваліся ў старажытнасці ў Вавілоніі, Кітаі, Грэцыі і інш. краінах. Адным з першых сонечных К. быў стараж.-егіпецкі (4 ст. да н. э.); у ім кожны год змяшчаў 12 месяцаў па 30 дзён, а ў канцы года дадавалася яшчэ 5 дадатковых дзён, якія не ўваходзілі ў склад месяцаў. Даўжыня года была роўная 365,2422 сярэдніх сонечных сутак. Сучаснае летазлічэнне развілося з стараж.-рым. сонечнага К., уведзенага ў 46 да н. э. Юліем Цэзарам і наз. юліянскім К. (ці старым стылем). Тры гады запар у гэтым К. мелі па 365 дзён, а 4-ы, высакосны — 366. Сярэдняя працягласць года 365,25 сутак. У 7 ст. было прынята лічыць, што высакосныя ўсе гады, нумар якіх дзеліцца на 4. Такі сярэдняя працягласць года ў юліянскім К. на 11 *мін* 14 *сек* большая за трапічны, то за кожныя 128 гадоў набіраецца памылка на 1 суткі. Таму у канцы 16 ст. вясенняе раўнадзенства наступіла ўжо 11 сакавіка замест 21, як было ў 325 н. э., калі юліянскі К. быў прыняты хрысціянскаю царквою. Гэтую памылку на 10 сутак выправілі ў 1582 пры папе рымскім Грыгорыі XIII увядзеннем новага К., які атрымаў назву грыгарыянскага (ці новага стылю). Розніца паміж старым і новым стылямі: 10 сутак для дат з 5.10.1582 да 18.2.1700 (тут і далей уключна); 11 сутак — з 19.2. 1700 да 17.2.1800; 12 сутак — з 18.2.1800 да 16.2.1900; 13 сутак — з 17.2.1900; у 21 ст. розніца на 13 сутак астанецца. Па новым стылі год, нумар якога канчаецца на 2 нулі і не дзеліцца без астачы на 400, не лічыцца высакосным. Грыгарыянскім К. карыстаецца большасць краін свету. У Сав. Расіі новы стыль уведзены ў 1918, калі замест 1 лютага с. ст. сталі лічыць 14 лютага н. ст. Недахопы сучаснага К.— розная працягласць месяцаў, кварталаў, дні тыдня не супадаюць з якімі-н. пастаяннымі датамі. Пытаннем рэформы К. займаецца эканамічны і сацыяльны савет ААН.

Літ.: Селешников С. И. История календаря и хронология, М., 1970.

М. П. Ерпылёў. Масква.

КАЛЯНДАРНА-АБРАДАВАЯ ПАЭЗІЯ, паэзія аграрных свят, песні працоўнага года земляроба. Вытокі К.-а. п. ў родавым грамадстве. Наглядаючы змены пораў года, біял. цыклы ў развіцці раслін і жывёл, стараж. чалавек, моцна залежны ад прыроды, імкнуўся зрабіць уплыў на яе: запабегнуць злым сілам, выклікаць урадлівасць нівы, спор і прыплод у гаспадарцы. Жаданага спадзяваўся дасягнуць праз абрадавыя дзеянні і словы, у магічную, цудадзейную моц якіх непарушна верыў. Практычная гасп. дзейнасць земляроба, грамадскі быт — у аснове песень гадавога круга. Гэта паэзія зямлі ў самым непасрэдным сэнсе слова. Назіранні над кругаваротам у прыродзе і земляробчай працай склаліся ў сістэму, своеасаблівы гасп. каляндар. Ён уключаў шэраг святкаванняў агр. характару, уласцівыя ім абрады і рытуалы, багата песень, прыкметы і інш. Пазней хрысціянства ў барацьбе з язычніцтвам імкнулася прыстасаваць свае святкаванні да стараж. земляробчага календара. Нар.-паэт. стыхія толькі часткова, вонкава ўспрыняла некат. элементы хрысц. міфалогіі, перапрацаваўшы іх адпаведна стыхійна-матэрыялістычным у аснове сваёй земляробчым уяўленням і свайму паэт. бачанню свету. Юр'я, Мікола, Пятро, Ілья з песень гадавога круга — гэта тыя ж сялянне-земляробы — раталі, сейбіты. І клопат іх пра жыта караністае ды каласістае, пра юр'еўскую расу ў дзень першага выгану скаціны ў поле, пра пагодлівы сенакос і добры ўжон збожжа, пра раі семяністыя і табуны коней — чыста сялянскі клопат. Неаднолькавыя метэаралаг. ўмовы вясны, лета, восені і зімы, разнастайны характар гасп. дзейнасці ў кожным каляндарна-вытворчым сезоне абумовілі функцыянальныя асаблівасці паэзіі гадавога круга, яе цыклізацыю. Сучасныя фальклярысты і этнографы (У. Чычараў, У. Проп, С. Токараў, К. Чыстоў) з увагі на працоўную аснову і наяўны рус. песенны матэрыял падзяляюць каляндарныя абрады і паэзію на тры цыклы. Развітасць у паэзіі бел. земляробчага календара песенных відаў усіх чатырох аграрна-вытворчых сезонаў, акрэсленая працоўная аснова восеньскага цыкла (уборка яравых, апрацоўка лёну, канапель, збор грыбоў і інш.) і адметная муз. прырода *восеньскіх песень* даюць падставу гаварыць пра чатыры цыклы бел. К.-а. п.: зімовы, веснавы, летні і асенні.

Зімовы перыяд земляробчага календара і ўласціві яму абрады і паэзія мелі на мэце загадаў забяспечыць ураджай і прыплод скаціны на ўвесь год. Сярод зімовых святкаванняў багаццем і каларытнасцю абрадаў вызначаліся *калядны*, бедная і багатая *куцця*, звязанае з імі *калядаванне* і шчадраванне, аграрная і любоўная варажба, культ продкаў у абрадах куцці. Калядкі і шчадроўкі (гл. *Калядныя песні*) яскрава выказвалі паэт. аспект зімова-каляндарнага цыкла. Масленічныя абрады і песні былі шырэй развіты толькі на ўсходзе Беларусі. Веснавыя абрады і песні (гл. *Веснавыя песні*) паводле стараж. уяўленняў пачвінны былі намагчы павялічыць ураджай і садзейнічаць захаванню жывёлы. У веснавы перыяд шырокае развіццё атрымала гуканне (кліканне) вясны, святкаванне *вялікадня* і звязанае з ім валачобніцтва (гл. *Валачобнікі*), карагодныя гульні і спевы (гл. *Карагод*). Абрадавы выган скаціны ў поле на Юр'я (23 крас.) быў гасп. асновай паэт. *юраўскіх песень*. Сёмуха з русальным тыднем, культам раслінпасці, абрад куста, траецкія, русальныя і куставыя песні складалі завяршальны раздзел веснавога цыкла і ўжо сталлі на мяжы летніх святкаванняў і песень. Летнія абрады і песні мелі на мэце аберагчы ўраджай у час уборкі і паспяховы збор зямных плёнаў. На гэта быў скіраваны іх магічны сэнс. Яскравасцю і паэтычнасцю вылучаюцца *Купалле, купальскія песні* і пятроўскія, жніво — *жажынкі* і *дажынкі* з усімі трыма падвідамі *жнівуных песень*, а ярка выражанымі сац. матывамі ў іх. Восеньскі цыкл быў найбольшым на абрады. У ім найб. значнае месца займаў культ продкаў — *дзядоў*. Сярод восеньскіх святкаванняў

вылучаліся багач, пакровы, змітроўскія дзяды. На восень прыпадала найб. вясельлю. Таму асн. месца ў асенніх песнях заняла вясельная тэматыка. Восеньская песня побач з валачобнымі і інш. вызначае самабытнасць бел. каляндарнай паэзіі, яе адметнасць. Позняя восень, калі селянін пасля збору ў палёў і васеву азімых меў перадышку ў гасп. рабоце, была спрыяльным часам для розных традыц. збораў (супрадкі і інш.), дзе спявалі, загадвалі загадкі, дэкламавалі, расказвалі казкі. Некат. фальклярысты схільны лічыць асенніе вечары найб. прадуктыўным перыядам развіцця нар.-паэт. творчасці. К.-а. п. разнастайная ў жанравых адносінах: уключае абрадавыя песні заклінальныя, велічальныя, песні лірычныя, што паводле сталай нар. традыцыі прымеркаваны да пэўных цыклаў, а таксама прыгаворы, драматызаваныя дыялогі, прыказкі. Нар. прыкметы, выказаныя ў форме прыказак, маюць аграрны сэнс, перадаюць назіранні за жыццём прыроды ў дастасаванні да працы земляроба, практычныя веды, парады: «Сей авёс у грязь — будзеш, як князь»; «Калі на куццю падае снег ці ўшчанецца мяцеліца — будуць добра раіцца пчолы»; «Зорнае неба на куццю — ураджай на ягады і грыбы», «Іней на дрэвах — багатая квецень у садах»; «Красавік з вадою — май з травою». Функцыянальнае прызначэнне каляндарнай паэзіі вызначыла яе маст. прыроду. Вобразы К.-а. п. ўзяты з гасп.-вытворчага побыту земляроба. Вясна, зіма, даспелае жыта, жніво, спарыш, раёк, купалка і інш. побач з вобразамі дзяўчат, хлопцаў, гаспадароў і гаспадынь — асн. мастацкія вобразы калядак, валачобных, купальскіх, жніўных і інш. песень. К.-а. п. найчасцей карыстаецца прыёмамі гіпербалы (асабліва ў велічальных песнях), увасабленнем. Напевы каляндарна-абрадных песень вызначаюцца абагульненасцю, ёмістасцю і надзвычайнай устойлівасцю меладычнага тыпу. Асаблівасці іх гучання звязаны з тым, што яны спяваліся на адкрытым паветры «голасна». З развіццём грамадства каляндарныя абрады, страціўшы першапачатковы магічны сэнс, перайшлі ў звычаі і найб. збераглісь у форме гульні. Строгая прымеркаванасць некат. відаў песень парушалася. Паасобныя трапілі ў іншыя цыклы і раздзелы або перайшлі ў дзіцячыя. Адна з гал. прычын гэтага — карэнныя перамены ў вытворча-гасп. укладзе. Дамінуючы жывучасці нар.-песенных традыцый і эстэтычнай вартасці К.-а. п. астаецца ў памяці пераважна старэйшага пакалення. Агульнапрызнана, што бел. К.-а. п.— найбагацейшая сярод паэзіі слав. народаў. Яна у многім вызначыла спецыфіку бел. нар.-паэт. творчасці, складае значны набытак нац. паэт. культуры.

Публ.: Бессонов П. Белорусские песни..., М., 1871; Носович И. И. Белорусские песни, у кн.: Записки имп. Русского географического об-ва по отделению этнографии, т. 5, СПб., 1873; Шейн П. В. Белорусские народные песни..., СПб., 1874; Ягоржж. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края, т. 1, ч. 1, СПб., 1887; Романов Е. Р. Белорусский сборник, т. 1 (в. 1—2). Киев, 1886, в. 8, Вильна, 1912; Радченко З. Гомельские народные песни, СПб., 1888; Довнар-Запольский М. Песни пинчуков, в. 1, Киев, 1895; Добровольский В. Н. (сост.). Смоленский этнографический сборник, ч. 4, М., 1903; Малевич С. Белорусские народные песни, СПб., 1907; Шлюбскі А. Матэрыялы да вывучэння фальклору і мовы Віцебшчыны, ч. 1, Мн., 1927; Гарэцкі М. і Ягораў А. Народныя песні з мелодыямі, Мн., 1928; Песні беларускага народа, т. 1, Мн., 1940; Сахараў С. П. Народная творчасць латгальскіх і ілукстэнскіх беларусаў, [в.] 1, Рыга, 1940; Беларускія народныя песні. Sanic Piosenki gminne ludu Pińskiego, Kowno, 1851; Federowski M. Lud białoruski, t. 5, Warszawa, 1958.

Літ.: Карский Е. Ф. Белорусы, т. 3, в. 1, М., 1916; Беларускай вуснапаэтычнай творчасць, Мн., 1966; Беларуская народная вуснапаэтычная творчасць, Мн., 1967; Гілевіч Н. С. Наша родная песня, Мн., 1968.

А. С. Ліс. Мінск.

КАЛЯНДРА (Coriandrum sativum), аднагадовая травяністая эфіраалейная расліна сям. парасонавых. Культывуецца на алей у Сярэдняй і Паўд. Еўропе, Амерыцы, у СССР — на Украіне, Каўказе, у Паволжы. На Беларусі вырошчваецца ў Цэнтр. бат. садзе АН БССР, на агародах як прыпраўная расліна, расце як пустазелле каля жылля.



Каляндра: *1* — расліна з кветкамі і пладамі; *2* — плод.

Сцябло галінастае, выш. да 70 см. Прыкаранёвае лісце трохраздзельнае, сцябловае—перыстарассечанае. Кветкі дробныя, белыя ці ружовыя, у складаных парасонніках. Плады — шарападобныя двухсямянкі з прыемным пахам, змяшчаюць да 1,2% эфірнага алею і да 27% тлустага алею. Эфірны алей выкарыстоўваецца ў парфумерна-касметычнай і інш. галінах прамысловасці, тлусты алей — у тэхніцы. Зялёная расліна і плады ўжываюцца як прыправа пры вырабе мясных кансерваў, у хлебна-кандытарскай і лікёра-гарэлачнай вытворчасці. Плады выкарыстоўваюцца ў медыцыне.

Літ.: Эфиромасличные культуры, М., 1963.

КАЛЯНКОЎСКІ (Kolankowski) Людвік (21.6. 1882—19.3.1956), польскі бурж. гісторык. Скончыў Львоўскі ун-т (1906). З 1929 праф. Віленскага, у 1937—39 Львоўскага ун-таў. Арганізатар ун-та ў Торуні (1945), яго прафесар. Працы К. прысвечаны паліт. гісторыі Вял. кн. Літоўскага 14—16 ст.

Тв.: Dzieje Wielkiego księstwa Litewskiego za Jagiellonów, t. 1. 1377—1499, Warszawa, 1930.

КАЛЯРОВАЕ КІНО, кіно з узнаўленнем натуральнай афарбоўкі адлюстравання.

Існуе мноства спосабаў атрымліваць каляровае адлюстраванне. Найб. пашыраны спосаб шматслойных каляровых плёнак. Плёнкі маюць тры святлоадчувальныя слаі з галоіднымі солямі серабра, у якія дададзены спецыяльныя рэчывы, што ператвараюцца пры праяўленні адлюстравання ў фарбавальнікі. Кожны з гэтых слаёў мае святлоадчувальнасць адпаведна да сініх, зялёных і чырвоных прамянёў святла і ўтварае пры праяўленні жоўтае, пурпуровае і блакітнае адлюстраванне. Каляровае адлюстраванне ў негатыве і пазітыве атрымліваецца ў выніку апрацоўкі каляровай кінаплёнкі ў спец. растворах. Асн. перавагі гэтага спосабу: высокая якасць каляровага адлюстравання; магчымасць атрымаць прамежкавы каляровы негатыў (кантратып), з якога робяць мноства фільмакопій; ужыванне стандартнай апаратуры для здымкі і праецыравання кінафільмаў.

Літ.: Цветная кинематография. Сб., М., 1955; Артюшин Л. Ф. Основы воспроизведения цвета в фотографии, кино и полиграфии. М., 1970.

КАЛЯРОВАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ, тэлебачанне ў натуральных колерах. Сістэмы К. т. заснаваны на атрыманні любога колеру і каляровага адцення ад змешвання ў вызначанай прапорцыі трох асн. колераў: чырвонага, сіняга і зялёнага. Ва ўсіх сістэмах выкарыстоўваюцца два працэсы: колеразняленне (у перадавальнай тэлевізійнай камеры) і колеразмешванне (у тэлевіз. прыёмніку).

Існуюць сістэмы К. т. з паслядоўнай і адначасовай перадачай колераў. У сістэме з паслядоўнай перадачай колераў перад перадавальнай і прыёмнай тэлевізійнымі трубкамі ўстанаўліваюцца адпаведныя святлофільтры, якія сінхронна круцяцца, што забяспечвае паслядоўны аналіз і сінтэз адлюст-

равання пачаргова ў чырвоных, сініх і зялёных прамянях. У такой сістэме, калі выкарыстоўваецца адзін агульны канал сувязі, спектр частот тэлевізійнага сігналу павялічваецца ў тры разы (паралельна з чорна-белай сістэмай), што значна ўскладняе канал сувязі. У сістэме К. т. з адначасовай перадачай колераў ствараюцца тры незалежныя каналы для назірання тэлевізійнага адлюстравання ў чырвоных, сініх і зялёных прамянях. У такой адначасовай сістэме тры асобныя каляровыя сігналы (так званыя сігналы колернасці) перадаюцца з дапамогаю трох асобных каналаў сувязі. Каляровае тэлевізійнае вяшчанне ў СССР ажыццяўляецца на аснове супольнай савецка-французскай сістэмы SECAM, распрацаванай у межах навук.-тэхн. супрацоўніцтва СССР і Францыі. У сістэме К. т. SECAM з адначасовай перадачай колераў па адным канале сувязі перадаецца поўны сігнал. Ён змяшчае суму яркаснага сігналу, які нясе інфармацыю пра яркасць адлюстравання, і двух сігналаў колернасці (чырвонага і сіняга), якія нясуць інфармацыю пра каляровы тон і насычанасць. Зялёны сігнал колернасці з дапамогаю спец. кадзіравальнага прыстасавання замяняецца на яркасны сігнал у перадавальнай тэлевізійнай камеры. У сістэме SECAM заблеспечваецца патрабаванне сумяшчальнасці: сігналы К. т. могуць быць прыняты ў чорна-белым выглядзе на звычайныя некаляровыя тэлевізійныя прыёмнікі і, наадварот, на каляровыя прыёмнікі могуць быць прыняты сігналы чорна-белага тэлебачання. Асн. перавага сістэмы SECAM у тым, што спектр частот поўнага відэасігналу адпавядае спектру чорна-белага і для гэтага не трэба расшыраць палосы прапускання канала сувязі. У СССР для К. т. прыняты такі ж стандарт, што і для чорна-белага: 625 радкоў пры 25 кадрах за секунду.

Літ.: Телевидение (общий курс), под ред. П. В. Шмакова, 3 изд., М., 1970; Самойлов В. Ф. и Хромой Б. П. Система цветного телевидения SECAM, М., 1967; Бартосяк А. Система цветного телевидения СЕКАМ, пер. с польск., М., 1968.

Б. М. Багдановіч. Мінск.

КАЛЯРОВАЯ МЕТАЛУРГІЯ, галіна прамысловасці па здабычы і абагачэнні рудаў, вытворчасці і апрацоўцы каляровых, рэдкіх і высакародных металаў. Гл. *Металургічная прамысловасць.*

КАЛЯРОВАЯ ФАТАГРАФІЯ, атрыманне адлюстравання ў натуральных колерах на спецыяльных фотаматэрыялах.

Найб. пашыраны спосаб фатаграфавання на трохслойнай фотакінаплёнцы з наслаёўным каляровым праяўленнем. Звычайным фотаапаратам атрымліваюць каляровы негатыў, з якога друкуюць на трохслойнай фотапаперы з каляровым праяўленнем шматколерныя пазітывы-адбіткі. На трохколерных плёнках з зваротам атрымліваюць непасрэдна пазітыўнае каляровае адлюстраванне. Гл. таксама *Фатаграфія.*

Літ.: Чельцов В., Симонов А. и Хоменко В. Цветное фотографирование, М., 1971; Косинский И. А. Радуга на плёнке. Книга о цветной фотографии, Л., 1965.

КАЛЯРОВЫ ДРУК, спосаб перадачы шматколерных выяў (арыгіналаў) у паліграфіі наслаёўным накладаннем каляровых фарбаў.

К. д. заснаваны на субтрактыўным і адытыўным спосабах змешвання колераў (гл. *Колераметрыя*). Існуюць тры асн. колеры — жоўты, сіні і чырвоны. Усе астатнія колеры — вытворныя ад змешвання асноўных. Таму кожны шматколерны арыгінал можна перадаць у тры фарбы. Друк у такім выпадку робіцца з трох друкарскіх формаў (для кожнай фарбы вырабляецца свая друкарская форма). Пры К. д. фарбы могуць класціся на паперу, не толькі перакрываючы адна адну, але і ў выглядзе змешаных па-рознаму афарбаваных элементаў (кропак у растравым друку, гл. *Растр*). Спалучэнне асобных кропак, напр. жоўтай і сіняй фарбаў, зрокава ўспрымаецца зялёным колерам, і г. д. Каляровае адценне ў такім выпадку вызначаецца памерам растравай кропкі (напр., калі памеры кропкі ў сіняй фарбе большыя за памеры кропкі ў жоўтай фарбе, то атрымліваецца сіне-зялёнае адценне). Ад змешвання ў розных прапорцыях фарбаў трох колераў можна атрымаць каляровую гаму ва ўсёй разнастайнасці колераў і іх адценняў.

Літ.: Поперядухин П. А. Технология печатных процессов, М., 1968. *Р. І. Шапавалава.* Мінск.

КАЛЯРОВЫЯ МЕТАЛЫ, прамысл. назва ўсіх металаў і іх сплаваў, выключаючы *жалеза* і яго сплавы. Тэрмін К. м. ў бел. мове адпавядае тэрміну «нежалезныя металы» ў многіх інш. мовах (напр., англ., франц., ням.).

Адрозніваюць К. м.: цяжкія (медзь, нікель, свінец, марганец і інш.), лёгкія (алюміній, магній, літый, берылій), рэдкія, у т. л. радказямельныя (цырконій, ніобій, малібдэн, лантан, цэрый і інш.), і высакародныя (волата, серабро, плаціна). Найб. тэхн. выкарыстанне маюць сплавы на аснове алюмінію (*дуралюмін*, сілумін), медзі (*бронза, латунь*), магнію, нікелю, тытану, волава і свінцу, цынку, цырконію і берылію. Многія з К. м. з'яўляюцца легіравальнымі элементамі канструкцыйных і інструментальных сталяў.

Літ.: Мальцев М. В. Металлография промышленных цветных металлов и сплавов, М., 1970; Материалы в машиностроении. Справочник, т. 1, М., 1967.

П. А. Пархуцік. Мінск.

КАЛЯШЧЫТАПАДОБНЫХ ЗАЛОЗ ХВАРОБЫ, эндакрынныя хваробы з анатамічнымі і функцыянальнымі зменамі каляшчытападобных залоз (гл. *Залозы*). Адрозніваюць гіперпаратырэоз і гіпапаратырэоз.

Гіперпаратырэоз (хвароба Рэклінгхаўзена, паратырэоідная астэадыстрафія) бывае пры пухлінах гэтых залоз, хранічным піэланефрыце. Прыкметы: павялічваюцца функцыя (гіперфункцыя) і памеры (гіперплазія) каляшчытападобных залоз, парушаецца абмен кальцыю і фосфару, крохкасць костак, назапашваюцца солі ў нырках, страваваль-кішачным тракце, крывяносных сасудах. Лячэнне: хірургічнае і кансерватыўнае (тыракальцытанін). Гіпапаратырэоз (тэтанія) бывае пры аперацыях на шчытападобнай залозе, траўмах і інфекцыях каляшчытападобных залоз. Адрозніваюць 2 формы: скрытую (латэнтную) з паніжэннем адчувальнасці рук, ног і яўную з танічнымі сутаргамі і спазмамі мышцаў рук, ног, твару, гартані. Лячэнне: скрытай формы — паратырэоідзін, дыэта (з абмежаваннем мяса, малака), солі кальцыю; яўнай — таксама ях і скрытай, дадаткова наркатычныя і васпакальныя сродкі, вітамін B_2, хірург. аперацыі.

Літ.: Основы эндокринологии, 2 изд., Мн., 1967; Шурыгин Д. Я. и Попов С. Е. Пособие по клинической эндокринологии, Л., 1968.

Н. М. Дразнін. Мінск.

КАМА, рака ў РСФСР, найбольшы прыток Волгі. Даўж. 1805 *км*, пл. бас. 507 тыс. *км*². Пачынаецца на Верхнякамскім узв. на тэр. Удмурцкай АССР, верхняе і сярэдняе цячэнне ў Кіраўскай і Пермскай абл., ніжняе часткова ў Удмурцкай АССР і Башкірскай АССР, большая частка ў Татарскай АССР, дзе К. ўпадае ў Куйбышаўскае вадасховішча.

У вярхоўі цячэ ў нізкіх забалочаных берагах. Вышэй г. Пярмі плаціна Камскай ГЭС (504 тыс. *квт*) і вадасховішча (пл. 1915 *км*², аб'ём 12,1 *км*³), ніжэй Воткінска — Воткінская ГЭС (1 млн. *квт*) і вадасх. (пл. 1120 *км*², аб'ём 9,4 *км*³). Будуюцца (1972) Ніжнякамская ГЭС (1080 тыс. *квт*) і вадасх. (пл. 2850 *км*², аб'ём 13,0 *км*³). Гал. прытокі: Вішэра, Чусавая, Белая (левыя), Вятка (правы). Жыўленне пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 3770 *м*³/*сек*. Суднаходная ад вусця да Керчаўскага (1232 *км*), у разводзе да вусця р. Порыш (1535 *км*). На Камска-Пячорска-Вычэгодскім водападзеле будуецца (1972) сістэма вадасховішчаў для перакідкі водаў Пячоры і Вычэгды праз К. ў Волгу. Гал. прыстані: Бераэнікі, Перм, Краснакамск, Сарапул, Набярэжныя Чаўны, Чыстапаль.

Б. Б. Багаслоўскі. Мінск.

КАМАІ, вёска ў Пастаўскім р-не Віцебскай вобл., на беразе Малога і Вялікага Камайскага азёраў. Цэнтр сельсавета і калгаса «Дружба». За 18 *км* на ПдЗ ад Паставаў, 268 *км* ад Віцебска, 12 *км* ад чыг. ст. Гадуцішкі (Літ. ССР), аўтобусная ст. на скрыжаванні дарог Паставы — г. п. Лынтупы і в. Нарач — в. Гадуцішкі (Літ. ССР). 432 ж., гасп. 164 (1971). Сепаратарны пункт, млын, швейная майстэрня. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, аптэка, вет. пункт, адд. сувязі, сталовая, 4 магазіны. Помнік на брацкай магіле 105 сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны. Збіраецца *Камайскі касцёл* — арх. помнік 17 ст.



Камайскі касцёл. План.

КАМАЙСК, вёска ў Докшыцкім с/с Докшыцкага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Камайскі». За 9 *км* на ПдУ ад Докшыц, 220 *км* ад Віцебска, 20 *км* ад чыг. ст. Параф'янава. 545 ж., гасп. 172 (1971). Швейная майстэрня. Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, адд. сувязі, магазін. У ліст. 1943 ням.-фаш. захопнікі спалілі вёску. Помнік 42 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

КАМАЙСКІ КАСЦЁЛ, храм абарончага тыпу. Пабудаваны ў 1603—06 у в. Камаі (Пастаўскі р-н Віцебскай вобл.). Амаль квадратны ў плане, мае вял. паўкруглую апсіду, якая надае ўнутранай прасторы зальны характар. Па баках гал. фасада 2 цыліндрычныя вежы (выш. 6 *м*, дыяметр 5 *м*) з круглымі амбразурамі. Фасад завершаны трохвугольным шчытом. Вонкавае аблічча К. к. суровае. Адзінае ўпрыгожанне — 4 арачныя ніши ў верхняй частцы фасада. Іл. гл. таксама ў арт. *Вялікае княства Літоўскае.*

КАМАНДА ў вылічальнай тэхніцы (позналац. commando загадваю), спецыяльны *код*, які вызначае выкананне адной канкрэтнай аперацыі электроннай лічбавай вылічальнай машынай (ЭЛВМ). У тэлекіраванні — эл. сігнал, уздзеянне якога на сістэму тэлекіравання прыводзіць да выканання пэўнага распараджэння.

К. змяшчаецца ў памяці ЭЛВМ і складаецца з трох частак: аперацыйнай (паказвае код аперацыі), адраснай (адрасы лічэек, змесціва якіх удзельнічае ў выкананні аперацыі) і службовай. Паводле колькасці адрасоў у адраснай частцы К. ЭЛВМ падзяляюцца на адна-, двух-, трохадрасныя і з пераменнай адраснасцю; паводле тыпу аперацый, якія выконваюцца ЭЛВМ, на К. арыфметычных, лагічных аперацый, аперацый кіравання, абмену інфармацыяй. Паслядоўнасць К., неабходных для рэалізацыі *алгарытма*, стварае *праграму*. У тэлекіраванні перадача К. ад кіравальнага аб'екта да кіруючага ажыццяўляецца з дапамогаю праводных лічбавых ліній ці па радыё.

С. У. Доўнар. Мінск.

КАМАНДНЫ ПУНКТ (КП), спецыяльна абсталяванае месца, адкуль камандзір і штаб кіруюць баявымі дзеяннямі падначаленых войск. Абсталёўваецца неабходнымі тэхн. сродкамі сувязі і кіравання войскамі, а рухомы КП — неабходнымі сродкамі перасоўвання, каб забяспечыць атрыманне бесперапыннай інфармацыі аб праціўніку, ацэнку становішча, прыняцце рашэнняў і хуткую перадачу іх войскам.

КАМАНДОРСКІЯ АСТРАВЫ, у паўд.-зах. частцы Берынгавага м., на У ад п-ва Камчатка. У складзе Камчацкай вобл. РСФСР. Уключаюць а-вы Берынга, Медны, Тапаркоў і скалы. Агульная пл. 1848 *км*². Вулкан. паходжання. Выш. да 751 *м*. Берагі скалістыя, мала парэзаныя. Клімат марскі. Расліннасць — лугі з вярбой і каменнай бярозай. Логавішчы марскога коціка, калана; ёсць пясец, «птушыныя кірмашы». Насельніцтва — рускія, алеуты. Марскі промысел, рыбалоўства, зверагадоўля. Нас. пункты: Нікольскае, Праабражэнскае. К. а. адкрыты рус. мараплаўцам В. Берынгам у 1741.

КАМАНІШНІК (Succisa), род шматгадовых травяністых раслін сям. варсянкавых. Вядомы 1 від — К. лугавы (S. pratensis), пашыраны ў Еўропе і Азіі. На Беларусі нар. назвы: каманіца, каноплі лясныя, папы.


Каманішнік лугавы.

Расліна выш. 40—100 *см*. Сцябло прамастойнае з доўгімі міжвузеллямі. Лісце цэласнае, ланцэтнае, на сцябле супраціўнае, пры карані ў разетцы. Кветкі сіне-фіялетавыя, блакітна-бэзавыя, радзей белыя, у галоўчатых суквецціях. Плод — сямянка. Расце на лугах, па ўзлесках, у хмызняках. Меданосная і лекавая расліна, мае сапаніны, гліказіды, дубільныя рэчывы.

Літ.: Лекарственные растения. Дикорастущие, 4 изд., Мн., 1968.

КАМАРОВА, вёска ў Мядзельскім р-не Мінскай вобл., каля р. Струна (2 *км*). Падпарадкоўваецца Свірскаму гарпасялковаму Савету. Цэнтр саўгаса «Канстанцінава». За 38 *км* на З ад Мядзела, 201 *км* ад Мінска, 17 *км* ад чыг. ст. Лынтупы, каля аўтамаб. дарогі Полацк — Вільнюс. 964 ж., двароў 153 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання, мех. майстэрні. Сельскае прафес.-тэхн. вуч., васьмігадовая школа, школа сельскай моладзі, клуб, б-ка, дзіцячы сад, фельч.-ак. пункт, адд. сувязі, сталовая, 2 магазіны. Помнік 22 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

КАМАРОВІЧЫ, вёска ў Петрыкаўскім р-не Гомельскай вобл., каля р. Арэса (2 *км*). Цэнтр сельсавета і саўгаса «Камаровічы». За 56 *км* на Пн ад Петрыкава, 224 *км* ад Гомеля, 46 *км* ад чыг. ст. Муляраўка. 1112 ж., двароў 331 (1971). Лясніцтва, швейная майстэрня, пякарня. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячы сад, бальніца, адд. сувязі, сталовая, 3 магазіны. У 1943 у К. размяшчаўся Палескі падпольны абком КП(б)Б і штаб Палескага партыз. злучэння. 8.3.1943 вёску спалілі ням.-фаш. захопнікі, загубілі 112 мірных жыхароў. Брацкія могілкі 53 сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны, помнік і мемарыяльная дошка на ўшанаванне іх памяці.

КАМАРОВІЧЫ, вёска ў Рэчыцкім с/с Чэрыкаўскага р-на Магілёўскай вобл., на р. Волчас. Цэнтр калгаса «Краіна Саветаў». За 12 *км* на ПнУ ад Чэрыкава, 114 *км* ад Магілёва, 23 *км* ад чыг. ст. Крычаў 1-ы. 334 ж., гасп. 106

(1971). Пач. школа, клуб, б-ка, магазін. У вер. 1943 вёску спалілі ням.-фаш. захопнікі.

КАМАРОЎ Дзмітрый Яўлампіевіч (2.11.1922, с. Сенчуваж Вятлужскага пав. Кастрамской губ.—4.9.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). На фронце з 1943. Вызначыўся ў Бабруйскай аперацыі. 25.6.1944 экіпаж танка — лейтэнант К. і механік-вадзіцель М. А. *Бухтуеў* — у баі за ст. Чорныя Броды каля Бабруйска знішчыў 2 варожыя гарматы і амаль узвод варожай пяхоты, падпаленым танкам тараніў варожы браняпоезд. Загінуў К. у баі пры вызваленні Польшчы. Яго імя навечна занесена ў спісы Далёкаўсходняга танкавага вучылішча.



КАМАРОЎ Уладзімір Лявонавіч [1(13).10.1869, Пецярбург — 5.12.1945], савецкі батанік і географ. Акад. АН СССР (1920). Прэзідэнт АН СССР (1936—45). Герой Сац. Працы (1944). Скончыў Пецярбургскі ун-т (1894). З 1898 выкладчык гэтага ун-та, праф. (1918); з 1899 адначасова працаваў у Бат. садзе (з 1931 Бат. ін-т АН СССР). Дырэктар Ін-та гісторыі прыродазнаўства АН СССР (1944). Навук. працы па сістэматыцы, фларыстыцы і геаграфіі раслін. Даследаваў флору Кітая і Д. Усходу. Распрацаваў канцэпцыю віда ў раслін. Стваральнік метаду радоў, выкарыстанага для адлюстравання эвалюц. працэсу. Кіраўнік выдання «Флора СССР». Імя К. прысвоена Бат. ін-ту АН СССР. Дэп. Вярх. Савета СССР 1-га скл. Дзярж. прэмія СССР 1941, 1942. Узнаг. 3 ордэнамі Леніна.

Тв.: Избр. соч., т. 1—12, М.—Л., 1945—58.
Літ.: Гвоздецкий Н. А., В. Л. Комаров, М., 1953.

КАМАРОЎ Уладзімір Міхайлавіч (16.3.1927, Масква — 24.4.1967), лётчык-касманаўт СССР. Інжынер-палкоўнік. Двойчы Герой Сав. Саюза (1964, 1967). Чл. КПСС з 1952. Скончыў спец. школу ВПС (1945), Батайскае ваен. авіяц. вуч. (1949) і Ваенна-паветраную інж. акадэмію імя Жукоўскага (1959). З 1960 у атрадзе касманаўтаў. Упершыню ў свеце (12.10.1964 з К. П. *Феакціставым* і Б. Я. *Ягоравым*) здзейсніў палёт у космас на шматмесным касм. караблі *«Узыход»*. Загінуў пры пасадцы ў час выпрабавання новага касм. карабля «Саюз-1», пасля сутачнага палёту вакол Зямлі. Пахаваны на Краснай плошчы ў Маскве. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Чырв. Зоркі, медалямі, а таксама ўрадавымі ўзнагародамі многіх замежных дзяржаў. Імем К. названы кратэр на адваротным баку Месяца.



КАМАРОЎ Уладзімір Сямёнавіч (н. 29.1.1923, в. Княжыцы Магілёўскага пав. Гомельскай губ.), беларускі савецкі хімік. Чл.-кар. АН БССР (1970), д-р хім. н. (1969). Чл. КПСС з 1961. Скончыў БДУ (1952). Удзельнік Айч. вайны. З 1969 дырэктар Ін-та агульнай і неарганічнай хіміі АН БССР. Навук. працы па тэрмадынаміцы набракання высокапалімераў у бінарных сумесях, адсорбцыі з растораў, па вывучэнні структуры, фізіка-хім. і каталітычных уласцівасцей прыродных сарбентаў. Распрацаваў метады актывацыі глінаў. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.



Тв.: (Разам з Р. Л. Старобінцам) Каучукоподобные полимеры-сорбенты и хроматографические материалы, Мн., 1959; Адсорбционно-структурные, физико-химические и каталитические свойства глин Белоруссии, Мн., 1970.

КАМАРОЎКА, вёска ў Тамашоўскім с/с Брэсцкага р-на, каля р. Буг (2,5 *км*). Цэнтр калгаса імя Дзяржынскага. За 67 *км* на Пд ад Брэста, 3 *км* ад чыг. ст. Уладава, каля аўтамаб. дарогі Брэст — Тамашоўка (0,5 *км*). 812 ж., гасп. 244 (1971). Клуб, б-ка, аддз. сувязі, магазін. Помнік воінам-аднавяскоўцам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

КАМАРОЎКА, вёска ў Касцюшкавіцкім с/с Крычаўскага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр калгаса «Камунар». За 8 *км* на З ад Крычава, 112 *км* ад Магілёва, 12 *км* ад чыг. ст. Крычаў 1-ы. 322 ж., гасп. 120 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, магазін. У вер. 1943 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі.

КАМАРОЎКА, вёска ў Каменна-Лаўскім с/с Шклоўскага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр калгаса «Чырвоны Кастрычнік». За 7 *км* на Пд ад Шклова, 25 *км* ад Магілёва (па аўтамаб. дарозе), 10 *км* ад чыг. ст. Шклоў. 222 ж., двароў 78 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. і вет. пункты, аддз. сувязі, магазін. У 1944 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі. Помнік на брацкай магіле 47 сав. воінаў Айч. вайны.

КАМАРОЎСКАЕ, балота ў межах г. Мінска. Займае водападзельную катлавіну. Пл. 220 *га*. Тарфяны пакład нізінны, месцамі зверху мезатрофны. Расліннасць дроўна-багнавай групы з удзелам бярозы, вольхі, чароту, асакі, разнатраўя, імхоў. Тарфяны масіў асвоены Мінскай балотнай станцыяй. За 50 гадоў тра та тарфянога пакладу каля 1 *м*. Мелказалежная ўсх. частка балота забудавана, астатняя — пад доследнымі пасевамі. На балоце К. даследуецца водны, цеплавы, біяхім. рэжым асушанага тарфяніку, вывучаецца колькасць і якасць ураджаю. Вынікі шматгадовых (з 1911) назіранняў выкарыстоўваюцца для прагназіравання працэсаў на землях Беларусі, дзе вядзецца меліярацыя. *А. П. Підоплічка.* Мінск.

КАМАРОЎСКАЯ КУЛЬТУРА, археал. культура плямёнаў сярэдзіны бронзавага веку (15—12 ст. да н. э.), якія жылі на тэр. Зах. Украіны, у вярхоўях Днястра, Паўд. Буга, Стыра, Гарыні. Назву атрымала ад могільніка каля с. Камарова Івана-Франкоўскай вобл. Насельніцтва жыло ў зямлянках і паўзямлянках на селішчах, займалася земляробствам і жывёлагадоўляй, ужывала керамічны посуд, крамяпёвыя прылады працы і зброю, бронзавыя і залатыя ўпрыгожанні. Нябожчыкаў хавалі ў каменных скрынях або спальвалі, пахаванні ў грунтавых магілах, часам у курганах. К. к. ўзнікла на аснове адной з груп *шнуравой керамікі культуры*, блізкая да *тшцінецкай культуры* і *сосніцкай культуры*. Плямёны К. к. многія даследчыкі лічаць далёкімі продкамі славян.

Літ.: Нариси стародавньої історії Української РСР, Київ, 1959. *У. Ф. Ісаенка.* Мінск.

КАМАРЫ, агульная назва групы сямействаў даўгавусых насякомых атр. двухкрылых. Тыповыя прадстаўнікі групы — К. сапраўдныя (Culicidae). Каля 2000 відаў, пашыраных у Еўропе, Амерыцы, Паўн. Афрыцы, Зах. Азіі. У СССР 8 родаў, 86 відаў, на Беларусі каля 40 відаў. Найб. вядомы К. звычайны (Culex pipiens).



Камар звычайны.

Лічынкі і кукалкі К. развіваюцца пераважна на паверхні стаячых вадаёмаў, дарослыя жывуць у вільготных мясцінах. За лета выводзіцца адно або некалькі пакаленняў, апошняе зімуе. Самкі К.-крывасмокаў кормяцца крывёю названочных жывёл і чалавека, самцы — нектарам кветак. К.— самыя надакучлівыя насякомыя ў цёплы перыяд года (асабліва ў тайзе). Некат. К.-крывасмокі (напр., з роду Culex, Aedes, Anopheles) пераносяць узбуджальнікаў хвароб чалавека і жывёл (энцэфалітаў, ліхаманак). Найб. небяспечныя *малярыйныя камары*.

Літ.: Жизнь животных, т. 3, М., 1969; Определитель насекомых Европейской части СССР, т. 5, ч. 1, Л., 1969. *А. С. Шалапёнак.* Мінск.

КАМАРЫН, гар. пасёлак (з 1959; да 1962 цэнтр Камарынскага р-на) у Брагінскім р-не Гомельскай вобл., прыстань на правым беразе Дняпра. За 52 *км* на ПдУ ад Брагіна, 182 *км* ад Гомеля, 9 *км* ад чыг. ст. Елча. 1,6 тыс. ж. (1971). Прамысл. прадпрыемствы: камбінаты буд. матэрыялаў і быт. абслугоўвання, аддз. Сельгастэхнікі, лясгас. Сярэдняя школа, дзіцячыя яслі-сад, Дом піянераў, Дом культуры, б-ка, бальніца. Помнік на брацкай магіле 629 сав. воінаў і партызан Айч. вайны. Сярод пахаваных Героі Сав. Саюза Дз. Ф. *Грачушкін*, Ф. К. *Паўлоўскі*, М. А. *Якаўлеў*.

Камарын. Вуліца Леніна.



Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793) у складзе Расіі, мяст. Рэчыцкага пав. Мінскай губ. З жн. 1941 да ліст. 1943 акупаваны ням.-фаш. захопнікамі, якія загубілі ў К. 98 мірных жыхароў.

КАМАРЫЧЫ, вёска ў Навабыхаўскім с/с Быхаўскага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр калгаса імя Дзяржынскага. За 14 *км* на Пд ад Быхава, 65 *км* ад Магілёва, каля аўтамаб. дарогі Быхаў — в. Новы Быхаў. 521 ж., двароў 183 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Помнік 197 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

КАМАЎ Мікалай Ільіч [н. 1(14).9.1902, Іркуцк], савецкі авіяканструктар. Д-р тэхн. н. (1962). Гал. канструктар па верталётабудаванні Мін-ва авіяц. прамысловасці СССР (з 1940). Чл. КПСС з 1943. У 1923 скончыў Томскі тэхнал. ін-т. У 1929 стварыў першы сав. верталёт (аўтажыр) Каскр-1 «Чырвоны інжынер» (з інж. Н. К. Скрыжынскім), у 1931—35 — першы баявы аўтажыр А-7. Стваральнік верталётаў: Ка-8 «Іркуцяніна» (1945—48); карабельнага Ка-10 (1949—53); чатырохмеснага Ка-18 (1955—60); двухрухавіковага шматмэтавага Ка-26 (1964—67), а таксама вінтакрыла Ка-22 (1953—64) і інш. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.

КАМБАЙН (англ. combine літар. злучэнне), агрэгат з некалькіх рабочых машын, прызначаны выконваць поўны цыкл вытв. аперацый. Пачаткам такога цыкла можа быць здабыванне сыравіны, а канцом — выпуск прадукцыі.

Аб'яднанне некалькіх паслядоўных аперацый у К. паскарае вытв. працэс і павышае прадукцыйнасць працы за кошт выключэння міжаперацыйных страт часу і матэрыялу і шматлікіх пагрузачна-разгрузачных, транспартных і інш. работ. Адрозніваюць К. рухомыя (самаходныя і прычапныя) і стацыянарныя. Розныя тыпы К. найб. шырока выкарыстоўваюцца ў с. гасп. (гл. *Бураканборачны камбайн, Збожжавы камбайн, Кукурузаўборачны камбайн*, а таксама арт. *Бульбаўборачныя машыны, Ільноўборачныя машыны*) і ў горнай справе (гл. *Горны камбайн*). Літ. і іл. гл. пры адпаведных артыкулах.

КАМБАЙНАБУДАВАННЕ, галіна с.-г. машынабудавання, якая вырабляе камбайны для ўборкі збожжавых, тэхнічных і кармавых культур. У БССР сіласаўборачныя камбайны выпускае *Гомельскі завод сельскагаспадарчага машынабудавання*.

Першыя збожжаўборачныя камбайны ў СССР выпушчаны ў 1930 з-дам «Камунар» (Запарожжа). У 1932 пачалася серыйная вытворчасць камбайнаў на Растоўскім з-дзе с.-г. машынабудавання («Растсельмаш»), у 1936 — на Люберацкім з-дзе імя Ухтомскага. Пасля Айч. вайны адноўлены і расшыраны камбайнавыя з-ды: «Растсельмаш», Таганрогскі, Тульскі, Запарожскі «Камунар» (з 1960 аўтазавод), Краснаярскі, Дняпрапятроўскі і інш.; у 1966 уведзены ў строй Разанскі з-д бульбаўборачных камбайнаў. Створаны таксама новыя віды камбайнаў: у 1948 пачаўся серыйны выпуск бураканборачных, у 1951 — бульбаўборачных, у 1953 — кукурузаўборачных, у 1954 — сіласаўборачных. У 1960 СССР па вытворчасці камбайнаў выйшаў на 1-е месца ў свеце (звесткі пра развіццё К. ў СССР гл. ў табл.). Развіццё К. ажыццяўляецца ў адпаведнасці з прынятай у СССР сістэмай машын для комплекснай механізацыі с.-г. вытворчасці, ства-

раюцца высокапрадукцыйныя камбайны, у т. л. збожжаўборачныя «Ніва» і «Колас».

Вытворчасць камбайнаў у СССР (тыс. шт.)

Камбайны	1940	1950	1960	1965	1970
Збожжаўборачныя	12,8	46,3	59,0	85,8	99,2
Бураказборачныя	—	1,7	4,7	17,5	9,1
Бульбаўборачныя	—	0,1	0,1	4,9	7,0
Сіласаўборачныя	—	—	15,0	19,7	34,0

К. ў інш. сацыяліст. краінах развіваецца ў адпаведнасці з сацыяліст. падзелам працы. У 1969 у Румыніі вырашчана 4,4 тыс. шт., у Польшчы — 2,2 тыс. шт. Сярод капіталіст. краін К. найбольш развіта ў ЗША, ФРГ, Францыі, Вялікабрытаніі. Гл. таксама *Сельскагаспадарчае машынабудаванне* і літ. пры гэтым арт. *В. І. Крыцкі.* Мінск.

КАМБАЛЫ, камбалавыя (Pleuronectidae), сямейства рыб атр. камбалападобных. Вядома 44 роды, пашыраных амаль ва ўсіх морах, некат. віды заходзяць у нізоўі рэк. У СССР 28 відаў з 20 родаў.



Марская камбала.

Цела К. несіметрычнае, шырокае, пласкатае. Даўж. ад 7 см да 5 м, маса да 300 кг. Вочы і ноздры на адным баку. Плавальнага пузыра няма. Плаўнікі доўгія, мяккія, спінны заходзіць на галаву. К. вядуць донны спосаб жыцця. Зменьваюць колер верхняга боку цела ў залежнасці ад колеру грунту. Кормяцца чарвякамі, малюскамі, ракападобнымі, дробнаю рыбаю. К.—прамысл. рыбы. У СССР прамысл. значэнне маюць *палтусы*, жаўтапёрая К. (Limanda aspera), жаўтабрухая К. (Platessa quadrituberculatus), марская К. (Pl. platessa) і інш.

Літ.: Гл. пры арт. *Рыбы.*

КАМБАТАНТЫ (франц. combattant той, хто змагаецца), у міжнар. праве асобы, якія ўваходзяць у склад узброеных сіл пэўнай дзяржавы і ўдзельнічаюць у ваенных дзеяннях. Да К. адносяць увесь асабовы склад узбр. сіл (выключаючы мед. работнікаў, інтэнданцкі, ваен.-юрыд. і інш. персанал), а таксама апалчэнняў, добраахвотніцкіх атрадаў, арг-цый Руху Супраціўлення.

КАМБЕДЫ, гл. *Камітэты беднаты.*

КАМБІЙ (познелац. cambium абмен, змена), пастаянная ўтваральная тканка ў сцяблах і каранях голанасенных і двухдольных раслін, размешчаная паміж *драўнінай* і *лубам*; абумоўлівае рост органаў у таўшчыню (утварае другасную драўніну і другасны луб).

Складаецца з празенхімных клетак з тонкімі цэлюлозными абалонкамі. У сцяблах К. узнікае з пракамбію, у каранях — з клетак перыцыклу. Клеткі К. дзеляцца ў цёплую пару года. У асенне-зімовы перыяд у раслін нетрапічных зон дзейнасць К. прыпыняецца, у выніку гэтага ў драўных раслін утвараюцца гадавыя кольцы. Коркавы камбій, або фелаген, абумоўлівае ў драўных раслін утварэнне *корку.*

Літ.: Гл. пры арт. *Анатомія раслін.*

КАМБІКАРМЫ (камбінаваныя кармы), аднародныя сумесі розных кармоў, ачышчаных, здробненых і збалансаваных у залежнасці ад колькасці пажыўных рэчываў адпаведна з асаблівасцямі віду, узросту і гасп. выкарыстання жывёлы. Вырабляюцца паводле навукова абгрунтаваных рэцэптаў на камбікормавых з-дах (гл. *Камбікормавая прамысловасць*). Патрабаванні да якасці К. вызначаюцца дзярж. стандартамі.

Робяць К. поўнарацыённыя і К.-канцэнтраты. Поўнарацыённыя К. складаюцца з канцэнтраваных і грубых кармоў з дамешкамі біял. актыўных рэчываў (вітаміны, мікраэлементы, антыбіётыкі, ферменты і інш.); заменьваюць поўны сутачны рацыён жывёлы; выпускаюцца ў брыкетах і ў гранулах. К.-канцэнтраты складаюцца з розных канцэнтраваных кармоў і біял. актыўных рэчываў; скормліваюцца жывёле разам з грубымі і сакаўнымі кармамі, павышаюць пажнацэннасць рацыёну; выпускаюцца здробненыя, сыпкія, у гранулах. Камбікормавыя з-ды вырабляюць таксама бялкова-вітамінна-мінер. дабаўкі і абагачальныя сумесі. Бялкова-вітамінна-мінер. дабаўкамі (сумесь бялковых кармоў і біял. актыўных рэчываў) абагачаюць здробненыя зерневыя сумесі ў калгасах і саўгасах і К. на заводах. Прэмікспы (сумесь вітамінаў, мікраэлементаў, амінакіслот, ферментаў, антыбіётыкаў, лекавых і інш. рэчываў) ідуць на абагачэнне К. або бялкова-вітамінна-мінер. дабавак.

Літ.: Производство и использование комбикормов, М., 1964; Витамины в питании сельскохозяйственных животных и птицы, Мн., 1971.

Ю. С. Шкуркова. Жодзіна.

КАМБІКОРМАВАЯ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ, галіна прамысловасці па вытворчасці *камбікармоў* для с.-г. жывёлы, свойскіх птушак і рыбы. Неабходная ўмова развіцця жывёлагадоўлі на прамысл. аснове.

Першыя камбікормавыя прадпрыемствы на Беларусі пачалі будаваць пасля Вял. Айч. вайны. У 1970 было 22 з-ды і самастойныя цэхі пры мукамольных камбінатах агульнай магутнасцю 5500 *т* камбікармоў у суткі. Валавая вытворчасць камбікармоў у 1970 амаль удвая перавысіла ўзровень 1966 (гл. табл.). Найб. значныя з-ды К. п. ў БССР:

Вытворчасць камбікармоў у БССР за 1966—70

	1966	1967	1968	1969	1970
Выраблена камбікармоў:					
Усяго, тыс. *т*	817	962	1150	1450	1600
У тым ліку					
для свіней	533	587	753	855	825
для буйной рагатай жывёлы	120	186	177	313	520
для птушак	145	167	195	210	222
для інш. жывёлы і рыбы	19	22	25	72	33

Віцебскі, Магілёўскі, Слуцкі (пры мукамольных камбінатах, 465—495 *т* за суткі кожны), Жабінкаўскі (Брэсцкая вобл., 310 *т*), Жлобінскі (200 *т*). З агульнай колькасці камбікармоў 18% гранулявання і брыкетаваных (1970). У СССР К. п. пачала развівацца ў гады 1-й пяцігодкі. Найб. значныя з-ды: Арэнбургскі, Кіеўскі, Куйбышаўскі, Балашоўскі, Саратаўскі, Маскоўскі і інш., магутнасцю кожны 70—115 тыс. *т* камбікармоў за год.

Літ.: Полунина Н. И. Производство комбикормов в СССР и за рубежом, М., 1969; Соколов А. Я. Комбикормовые заводы, М., 1970.

У. Ф. Тарасевіч. Мінск.

КАМБІНАВАННЕ Ў ВЫТВОРЧАСЦІ, форма канцэнтрацыі вытворчасці, спалучэнне ў адным прадпрыемстве розных галін прамысловасці, якія выступаюць як паслядоўныя ступені апрацоўкі сыравіны ці адыгрываюць дапаможную ролю ў адносінах адна да адной. Найважнейшы прынцып камбінавання сацыяліст. вытворчасці — тэхніка-эканам. адзінства *асноўнай вытворчасці* і *дапаможнай вытворчасці*, аб'яднаных у прамысл. камбінаты.

Дае магчымасць комплексна выкарыстоўваць сыравіну, а таксама адходы перапрацоўкі, скарачаць вытв. цыкл, змяншаць капітальныя ўкладанні, выдаткі на перавозку паўфабрыкатаў, што садзейнічае росту прадукцыйнасці працы, зніжае сабекошт прадукцыі, скарачае затраты працы пры пераходзе ад адной стадыі апрацоўкі сыравіны да другой. Найб. развіта ў галінах, якія выкарыстоўваюць складаную па саставе сыравіну. У БССР шырока развіваецца пасля Вял. Айч. вайны. У Гомелі, Гродне, Полацку, Салігорску пабудаваны магутныя камбінаты, якія пастаўляюць сыравіну для лёгкай прамысловасці, мінер. ўгнаенні, нафтапрадукты. Развіваецца таксама камбінаванне прамысл. і с.-г. вытворчасці, што дае магчымасць больш поўна на працягу года выкарыстоўваць прац. рэсурсы вёскі, ствараць дапаможныя прадпрыемствы пачатковай апрацоўкі і перапрацоўкі с.-г. сыравіны.

Літ.: Ленін У. І. Імперыялізм, як вышэйшая стадыя капіталізму, Тв., т. 22 (Полн. собр. соч., т. 27); Кочетков Л. М., Ребров В. Д. и Тележкин Н. А. Химизация и комбинирование в промышленности СССР, М., 1965; Некрасов Н. Н. Экономика химической промышленности, М., 1966; Экономика социалистической промышленности, Мн., 1970; Строкова В. И. Комбинирование нефтеперерабатывающей и химической промышленности, Мн., 1966.

В. С. Маўрышчаў. Мінск.

КАМБІНАТ (лац. combinatio спалучэнне), 1) прамысл. прадпрыемства, якое аб'ядноўвае некалькі тэхналагічна звязаных паміж сабою спецыялізаваных вытворчасцей.

Ствараюцца з вытворчасцей, якія паслядоўна апрацоўваюць сыравіну да выхаду гатовай прадукцыі (прадзільная, ткацкая, аддзелачная ў тэкст. прамысловасці), або з вытворчасцей, якія аб'ядноўваюцца для комплекснага выкарыстання сыравіны (прадпрыемствы хім. прамысловасці спажываюць адходы каляровай металургіі).

2) Адміністрацыйнае аб'яднанне не звязаных тэхналагічна прадпрыемстваў адной галіны (вугальны камбінат) або дробных вытворчасцей (райпрамкамбінат, *камбінат бытавога абслугоўвання*). Гл. таксама *Камбінаванне ў вытворчасці.*

КАМБІНАТ БЫТАВОГА АБСЛУГОЎВАННЯ (камбінат бытавых паслуг), дзярж. шматгаліновае гаспадарча-разліковае прадпрыемства, якое выконвае работы і быт. паслугі паводле заказаў насельніцтва.

Аб'ядноўвае Дамы быту, атэлье, майстэрні і прыёмныя пункты, якія выконваюць індывідуальныя заказы насельніцтва або прымаюць іх для перадачы спецыялізаваным прадпрыемствам (вытворчасць і направа швейных, трыкатажных вырабаў, абутку, мэблі, прадметаў быт. тэхнікі, хім. чыстка і фарбаванне рэчаў, мыццё бялізны і г. д.). Падпарадкоўваюцца раённым (гарадскім) Саветам дэпутатаў працоўных і іх выканкомам і адначасова ўпраўленням быт. абслугоўвання насельніцтва аблвыканкомаў. Уваходзяць разам з інш. прадпрыемствамі быту ў сістэму Мін-ва быт. абслугоўвання насельніцтва. На 1.1.1972 у БССР было 135 К. б. а., у т. л. 118 раённых і 9 гарадскіх. Гл. таксама *Бытавое абслугоўванне насельніцтва* і літ. пры гэтым арт.

В. Ф. Маюшка. Мінск.

КАМБІНАТОРЫКА, раздзел матэматыкі, які вывучае ўласцівасці сукупнасцей (злучэнняў), што можна ўтварыць з элементаў некат. канечнага мноства. Асноўныя праблемы К. ўзніклі ў 17—18 ст. у алгебры многачленаў і тэорыі імавернасцей. Злучэнні падзяляюцца на перастаноўкі, размяшчэнні і спалучэнні. К. дастасавальная да тэорыі імавернасцей, да некат. пытанняў тэорыі груп, тэорыі лікаў, тэорыі графаў і да інш. раздзелаў матэматыкі.

Перастаноўкі — злучэнні з *m* элементаў, кожнае з якіх адрозніваецца ад другога парадкам размяшчэння элементаў (напр., з лікаў 1, 2, 3, 4 можна ўтварыць перастаноўкі: 1234, 1243, 1423 і інш.); агульны лік іх $P_m = 1 \cdot 2 \cdot 3 \ldots m = m!$. Размяшчэнні — злучэнні па *m* элементаў з ліку *n* зададзеных, розняцца парадкам ці самімі элементамі; агульны лік $A_n^m = \frac{n!}{(n-m)!}$. Спалучэнні — злучэнні, якія змяшчаюць *m* элементаў з *n* і адрозніваюцца адзін ад аднаго хоць адным элементам [напр., з элементаў 1, 2, 3, 4 можна скласці адно спалучэнне з 4 элементаў — 1234, 4 спалучэнні па 3 элементы — 123, 124, 134, 234 (123 і 213 не адрозніваюцца) і г. д.]; лік іх $C_n^m = \frac{A_n^m}{P_m} = \frac{n!}{m!\,(n-m)!}$.

Літ.: Виленкин Н. Я. Комбинаторика, М., 1969; Холл М. Комбинаторика, пер. с англ., М., 1970.

С. У. Доўнар. Мінск.

КАМБІНАЦЫЙНАЕ РАССЕЯННЕ СВЯТЛА, рассеянне святла ў вадкасцях, крышталях і газах, якое суправаджаецца значнаю зменаю частаты. Эксперыментальна праяўляецца ў выглядзе спектральных ліній, спадарожных лініі рэлееўскага рассеяння (гл. ў арт. *Рассеянне святла*). Адкрыта (1928) сав. вучонымі Г. С. Ландсбергам і Л. І. Мандэльштамам і незалежна ад іх інд. фізікам Ч. В. Раманам.

Частоты ліній вызначаюць як $\nu = \nu_0 \pm \nu_K$, дзе ν_0 — частата святла, якое падае на рэчыва, ν_K — уласныя частоты гэтага рэчыва (частоты унутрымалекулярных ваганняў і інш.). Калі ν меншае за ν_0, К. р. с. называецца стоксавым, пры ν большым за ν_0 — антыстоксавым. Адрозніваюць К. р. с. спантаннае і вымушанае. Пры рассеянні святла ад лазерных крыніц узнікае толькі спантаннае К. р. с. Вымушанае ўзнікае пры праходжанні магутных лазерных патокаў святла праз актыўнае да К. р. с. рэчыва. Яно можа суправаджацца значнай перадачай энергіі ад першаснага патоку да ліній К. р. с. і таму шырока выкарыстоўваецца для пераўтварэння частаты лазернага святла. Вывучэнне К. р. с. дае каштоўныя звесткі пра будову рэчыва і некат. яго фіз. параметры.

Літ.: Сущинский М. М. Спектры комбинационного рассеяния молекул и кристаллов, М., 1969; Брандмюллер И. и Мозер Г. Введение в спектроскопию комбинационного рассеяния света, пер. с нем., М., 1964; Бломберген Н. Нелинейная оптика, пер. с англ., М., 1966.

П. А. Апанасевіч. Мінск.

КАМБОДЖА, краіна ў Азіі на п-ве Індакітай. Пл. 181 тыс. км². Нас. 7 млн. чал. (1970). Сталіца Пнампень (1 млн. ж., 1971). Краіна падзяляецца на 20 правінцый (кхаэтаў). К. была канстытуцыйнай манархіяй. 9.10.1970 абвешчана Кхмерская Рэспубліка. Дзейнічае Канстытуцыя (за выключэннем артыкулаў, якія супярэчаць рэсп. ладу) ад 6.5.1947, перагледжаная і прынятая Нац. сходам 6.12.1955. Заканадаўчую ўладу ажыццяўляюць Нац. сход (вышэйшы заканадаўчы орган) і Сенат (кансультатыўны орган). Выканаўчая ўлада належыць Савету Міністраў на чале са старшынёй.



Прырода. Большая частка краіны — нізінная раўніна р. Меконг. Карысныя выкапні: фасфарыты,



Пнампень. Адна з цэнтральных вуліц.

магнезіт, руды каляровых металаў. Клімат субэкватарыяльны, з сухім сезонам снежань — красавік. Т-ра паветра ўвесь год 25—30 °С. Ападкаў 750—1500 *мм* за год. Гал. рака Меконг з прытокам Сап (выцякае з аднайменнага возера). Глебы чырвоныя і алювіяльныя. Расліннасць — пераважна саванны і лістападныя трапічныя лясы. Жывёльны свет багаты і разнастайны.

Насельніцтва. Каля 90% — кхмеры. Жывуць таксама кітайцы, в'етнамцы, народы інданезійскай групы і інш. Дзярж. мова кхмерская. Распаўсюджаны будызм, ёсць католікі і мусульмане. Найб. шчыльнасць у даліне Меконга, на ўзбярэжжы воз. Сап і Сіямскага заліва. Гарадскога нас. каля 20%. Значны горад і марскі порт Сіянуквіль (Кампонгсаом).

Гістарычны нарыс. Продкі пераважнай большасці сучаснага насельніцтва К.— кхмераў — жылі на тэр. краіны са стараж. часоў. У перыяд ранняга неаліту (5-е тысячагоддзе да н. э.) існавала родаплемянная арг-цыя. У 1—2 ст. н. э. ў дэльце р. Меконг узнікла дзяржава Фунань. З сярэдзіны 6 ст. ўзмацнілася роля інш. кхмерскіх дзяржаў. У 2-й пал. 7—8 ст. тэр. К. распалася на некалькі варожых княстваў. У 9 ст. ў дэльце Меконга і прылеглых да яе раёнах пачалося фарміраванне імперыі Камбуджадэша. На пач. 11 ст. яна ператварылася ў самую вял. дзяржаву п-ва Індакітай. У 9—11 ст. усталяваўся феад. лад, але перажыткі рабаўладання заставаліся да 12 ст. У канцы 13 ст. аслабленая войнамі і велізарным буд-вам храмаў імперыя Камбуджадэша распалася. У 14—16 ст. на тэр. К. існавала некалькі абласцей. Назва Камбоджа паявілася ў 15 ст. Пасля паражэння ад сіямскіх і дайв'етскіх войск К. з 17 да 2-й пал. 19 ст. была пад сюзерэнітэтам Сіяма і Дайв'ета (В'етнама). З сярэдзіны 19 ст. стала аб'ектам калан. экспансіі Францыі, у 1887 увайшла ў т. зв. Індакітайскі саюз, які быў створаны франц. каланізатарамі для цэнтралізацыі калан. кіравання. Народ К. няраз паўставаў супраць франц. каланізатараў. Барацьба за незалежнасць набыла форму сялянскіх паўстанняў. Найбольшага размаху дасягнула ў 30-я г. 20 ст. У 2-ю сусв. вайну значную частку тэр. краіны акупавала Японія. Выступленні кхмерскага народа супраць замежных імперыялістаў бязлітасна душыліся. Пасля паражэння Японіі (вер. 1945) К. зноў захапілі французскія войскі. Францыя імкнулася аднавіць калан. рэжым у краіне, але ў выніку нац.-вызв. руху К. ў 1949 абвешчана незалежнай дзяржавай у межах Франц. саюза. 9.11.1953 стала поўнасцю незалежнай. *Жнейскія пагадненні 1954* па Індакітаі пацвердзілі суверэнітэт К. У 1955 створана паліт. арг-цыя Нар.-сацыяліст. супольнасць (Сангкум), у якую ўвайшлі амаль усе партыі і паліт. арг-цыі, што існавалі ў К. У вер. 1955 Сангкум перамог на выбарах у Нац. сход. У К. былі ажыццёўлены некат. дэмакр. пераўтварэнні. З 1956 яна стала на шлях планавання эканомікі і кааперавання с. гасп. У знешняй палітыцы К. трымалася нейтралітэту. З 1955 чл. ААН. Закон 1957 абвясціў К. назаўсёды нейтральнай краінай. У 1956 устаноўлены дыпламат. адносіны з СССР. Расшырыліся эканам. і культ. сав.-камбаджыйскія сувязі і паліт. супрацоўніцтва абедзвюх краін. Сав. Саюз памагаў К. будаваць шэраг аб'ектаў. Беларусь паставіла К. станкі, прыборы, аўтамашыны, медпрэпараты і г. д. Імперыялісц. краіны, у прыватнасці чл. *Арганізацыі дагавору Паўднёва-Усходняй Азіі* (СЕАТО), якая знаходзіцца пад кантролем ЗША, няраз спрабавалі з дапамогай ваен. правакацый, эканам. блакады і дыпламат. націску перашкодзіць сац. прагрэсу ў К., звярнуць яе з нейтральнага курсу. 18.3.1970 правыя сілы К. з падтрымкай ЗША зрабілі пераварот. Нарадом Сіянук быў пазбаўлены ўлады (з чэрв. 1960 кіраўнік дзяржавы). Створаны ў выніку перавароту ўрад наладзіў цесныя сувязі з ЗША, Паўд. В'етнамам і Тайландам, адмяніў усе канстытуцыйныя правы і грамадз. свабоды. Ноччу на 1.5.1970 войскі ЗША і іх сайгонскія марыянеткі пад выглядам ліквідацыі «пагрозы жыццю амер. салдат, якія знаходзяцца ў Паўд. В'етнаме», уварваліся ў Камбоджу. Патрыят. сілы краіны ўзняліся на барацьбу супраць агрэсараў, стварылі Нац. адзіны фронт. Ён прыняў (май 1970) праграму барацьбы супраць амер. агрэсіі, за незалежнасць і нейтралітэт К. У выніку ўпартага супраціўлення патрыят. сіл, а таксама пад уплывам пратэстаў сусв. грамадскасці ЗША мусілі вывесці (да 30.6.1970) свае войскі з тэр. К. Але агрэсія не спынена. У К. асталіся сайгонскія войскі, якія праводзяць карныя аперацыі пад прыкрыццём ваенна-паветраных сіл ЗША. СССР і інш. сацыяліст. краіны рашуча асуджаюць эскалацыю агрэсіўных дзеянняў ЗША на п-ве Індакітай, памагаюць народу К. ў яго справядлівай барацьбе.



Гаспадарка. К.— адсталая аграрная краіна. Эканомі-



Камбаджыйскія сяляне, арыштаваныя паўднёва-в'етнамскімі карнікамі.

ка ў значнай ступені кантралюецца франц. і амер. капіталам. Агрэсія ЗША (з 1970) прывяла да заняпаду гаспадаркі; разбураны многія прамысл. прадпрыемствы, знішчаны пасевы с.-г. культур. Каля 80% самадзейнага насельніцтва занята ў с. гасп. Пераважае сялянскае землеўладанне, у 1969 было больш за 800 кааператываў. Гал. харч. і экспартная культура — рыс (збор каля 2200 тыс. *т*, 1969). На экспарт ідзе каўчук (выцв. 58 тыс. *т*, 1969) і часткова кукуруза (збор 130 тыс. *т*, 1969). Вырошчваюць цукр. трыснёг, тытунь, бавоўнік. У 1969 было буйн. раг. жывёлы каля 2,5 млн. галоў (пераважна буйвалы), свіней 1,1 млн. галоў. Штогод ловяць каля 200 тыс. *т* рыбы і нарыхтоўваюць каля 300 тыс. *т* каштоўнай драўніны. Найб. значныя прадпрыемствы — аўтазборачны, трактаразборачны, нафтаперапрацоўчы, фанерны, бавоўнаачышчальны, цукрова-рафінадны, лесапільны, патронны і інш. з-ды, прадпрыемствы па выт. цэменту, тэкстылю, паперы — амаль усе належаць дзярж. сектару. К. атрымала значную дапамогу ад сацыялісц. краін на буд-ва прадпрыемстваў дзярж. сектара. Ёсць невялікія прадпрыемствы па апрацоўцы каўчуку, вырабе ўгнаенняў, цэглы, джутавых мяшкоў, фарбаў, мыла, цыгарэт і інш. Выт. электраэнергіі 128,3 млн. *квт·гадз* (1968). Транспарт водны, чыгуначны, аўтамабільны. Даўж. чыг. 665 *км*, аўтадарог з цвёрдым пакрыццём каля 5 тыс. *км*. Гал. порты Сіянуквіль (Кампонгсаом) і Пнампень. К. вывозіць рыс (каля 50% экспарту), каўчук, драўніну, кукурузу; прывозіць нафтапрадукты, машыны, абсталяванне. Гандаль пераважна з Францыяй, Японіяй, Сінгапурам. Грашовая адзінка — рыель.

Камбоджа. Жыллё сяляніна.



Асвета. Пасля завалявання К. незалежнасці ўрад ажыццяўляе задачу пашырэння нар. асветы. Аднак в 1970 развіццё яе стрымліваецца ў сувязі з агрэсіяй амерыкана-сайгонскіх войск. Школы дзярж. і прыватныя. Абавязковае навучанне для дзяцей ад 6 да 12 гадоў. Пач. школы рэлігійныя — 3-гадовыя, навучанне на кхмерскай мове; свецкія пач. школы 6-гадовыя, навучанне з 3 кл. на франц. мове. У 1967/68 навуч. г. ў дзярж. пач. школах займалася 890,3 тыс. дзяцей, у прыватных рэліг.— 43,9 тыс. Сярэднія школы 7-гадовыя, на ўзор франц., маюць 2 ступені (4+3 гады). У 1967/68 навуч. г. ў дзярж. сярэдніх школах навучалася 90,0 тыс. чал., у прыватных — 9,5 тыс. У дзярж. прафесійных школах у 1967/68 навуч. г. займалася 3,7 тыс. чал., у прыватных — 2046. Вышэйшую адукацыю дае Кхмерскі ун-т і 17 спецыялізаваных калежаў, у т. л. Вышэйшае тэхн. вучылішча, пабудаванае з дапамогай Сав. Саюза (1964). У 1967/68 навуч. г. ў ВНУ К. навучалася 8,9 тыс. студэнтаў. Самыя вял. б-кі: Нац. ў Пнампені і б-ка Будыйскага ін-та. Музеі: Каралеўскі музей, Нац. галерэя ў Пнампені і інш.

Літаратура. У даангкорскі перыяд (2—9 ст.) развівалася прыдворная л-ра на санскрыце. Першыя помнікі на стараж.-кхмерскай мове вядомы з пач. 7 ст. Ангкорскі перыяд (802—1433) вызначаецца росквітам кхмерскай культуры: рамант. апісанні подзвігаў вялікіх людзей і багоў; творы Яшавармана II, Кавішвары, Ёкіндры, Субхадры; лірычная паэма Індрадэві; эпас «Рэамкер» на матывах інд. «Рамаяны»; творчасць Каасатхіпадэй Каў, Дуанга, Цьей Нона, Ікакпанга, Сампхеара, Пхакдэя, Аньцыта і інш. У сярэдні перыяд (1434—1862) створана нар. паэма-сказанне «Тум і Тэаў» (15 ст.). У перыяд франц. каланіялізму (1863—1953) нац. традыцыі прадоўжылі Сатан Прэйцьеа Эн, Саом Лоць, Ну Кан і інш.; Бамраэ Утэй Нгын напісаў паэму «Сратоп Цьек»; у 30-я г. паявіўся жанр рамана — «Пайлінская ружа» Ньёк Тхаема, «Сапхат» Рым Кіна, «Завялая кветка» Ну Хача. З абвяшчэннем незалежнасці (1953) кхмерская мова стала дзяржаўнай. У 1955 створана Асацыяцыя кхмерскіх пісьменнікаў. Праблемы будаўніцтва новага грамадства распрацоўваюць пісьменнікі Тыў Оль, Хэль Сумпха, Суон Сурын, Нон Саван і інш. Вядзецца вял. работа па збіранні і публ. фальклору.

Архітэктура, выяўленчае мастацтва. Ад старажытнасці на тэр. К. асталіся каменныя статуі, менгіры, бронзавыя урны. Характэрным жыллём кхмераў былі дамы на палях. У 7 ст. н. э. будаваліся прасаты — храмы-вежы, якія складалі ансамблі (Самбор-Прэй-Кук і інш.). Росквіт кхмерскага дойлідства прыпадае на 9—13 ст., калі ў раёне *Ангкора* узніклі 8 сталічных гарадоў і больш за 1000 арх. збудаванняў. Былі пашраны храмы-горы, якія ставіліся на прыродным ці штучным фундаменце і звычайна ў цэнтры горада. Адзін з найлепшых храмаў-гор — Баптэай-Срэй (967), яго пластычны дэкор — узор арганічнага зліцця скульптуры і арх. формаў. Самыя вял. храмавыя комплексы 12—13 ст. Ангкор-Ват і Ангкор-Тхом. Адметная рыса архітэктуры К.— багацце скульптуры (гіганцкія твары багоў на вежах храма Баён, каменныя разьбяныя рэльефы даўж. больш за сто метраў з вылавамі багоў, танцоўшчыц, пачвар і інш.). З 14 ст. каменнае дойлідства заняпадае. Пашыраецца драўляная і бронзавая скульптура, рэльефы заменьваюцца роспісамі. У каланіяльны перыяд у архітэктуры пануе эклектыка. Пасля абвяшчэння незалежнасці К. (1953) ужываюцца сучасныя прынцыпы горадабудаўніцтва (забудовы Пнампеня, новых гарадоў — Сіянуквіля (Кампонгсаома) і інш.), новыя буд. матэрыялы. З дапамогай Сав. Саюза ў Пнампені пабудаваны шпіталь і Вышэйшае тэхн. вучылішча. У пач. 20 ст. развіваецца жывапіс (роспісы і карціны мастака Окна Тэп Німіт Тлака), жыццё сучаснай К. адлюстравана ў жывапісе Ньек Дыма, ксілаграфіях Сам Юпа і інш. Пашыраны традыц. маст. рамёствы К.— разьба па дрэве (у спалучэнні з пазалотай і эмаліраванымі свінцовымі ўстаўкамі), слановай косці



Верхняя частка вежы храма Баён у Ангкор-Тхоме. 12—13 ст.

і па карале, выраб бронзавых званоў і посуду, роспісная кераміка, выраб шаўковых тканін, ювелірнае мастацтва, гравіроўка па метале, фігурнае пляценне.

Літ.: Дементьев Ю. П. Захват Камбоджи Францией. у кн.: Юго-Восточная Азия, М., 1958; яго ж. Политика Франции в Камбодже и Лаосе. 1852—1907, М., 1960; Поповкина Р. А. и Шилтова А. П. Камбоджа, М., 1958; Сочевко Г. Г. Современная Камбоджа (1941—1965), М., 1967; Всеобщая история искусств, т. 2, кн. 2, М., 1961; Всеобщая история архитектуры, т. 1, М., 1970; Прокофьев О. Искусство Юго-Восточной Азии, М., 1967.

І. Я. Афнагель (прырода, гаспадарка), *А. Я. Пейсаховіч, Я. Н. Марголін* (гістар. нарыс). Мінск; *З. К. Навокіна* (асвета), *Т. С. Праскуракова* (архітэктура, выяўл. мастацтва). Масква.

КАМБУРАЎ Пётр Георгіевіч (1860 — пасля 1914), беларускі архітэктар і інжынер-будаўнік. У 1885 скончыў Пецярбургскі ін-т грамадз. інжынераў. З 1887 працаваў у Магілёве (1892—95 губернскі, 1895—1914 гарадскі архітэктар). Пабудаваў у Магілёве гар. тэатр (1886—88), жаночае епархіяльнае вуч. (1892), дзярж. банк (1904—06; усе зберагліся), шмат жылых дамоў і культавых будынкаў у Магілёве і Магілёўскай губ. *В. М. Чарнатаў.* Мінск.

КАМЕДЗІ, арганічныя рэчывы, тое, што *гумі.*

КАМЕДЫЯ (грэч. kōmōdía, ад kṓmos вясёлая працэсія з музыкаю, песнямі і танцамі+ +ōdḗ песня), від *драмы*, у якім сродкамі *камічнага* высмейваюцца негатыўныя з'явы сац.-бытавога жыцця людзей. Жанравыя разнавіднасці К.— сатырычная, лірычная, сац.-бытавая, камедыя-памфлет, вадэвіль, інтэрмедыя, жарт, фарс, скетч.

К. зарадзілася на аснове фальклору ў Ст. Грэцыі. Вяршыня стараж.-грэч. К.— творчасць Арыстафана (5—4 ст. да н. э.), п'есам якога ўласцівая вострая паліт. накіраванасць. У Рыме вылучаліся камедыёграфы Плаўт і Тэрэнцый (3—2 ст. да н. э.). Узоры К. эпохі Адраджэння стварылі У. Шэкспір, Б. Джонсан у Англіі, Лопэ дэ Вэга ў Іспаніі, Н. Макіявелі ў Італіі; яны сцвярджалі рэаліст. пачатак у К., змагаліся за вызваленне чалавека ад путаў рэліг. сярэдневяковага аскетызму і містыкі. Вялікую ролю ў станаўленні К. ў зах.-еўрап. л-ры адыграла *камедыя дэль артэ.* У 17—18 ст. распад феад. і ўсталяванне капіталіст. адносін адлюстраваны ў рэаліст. камедыях Мальера і П. Бамаршэ (Францыя), К. Гальдоні (Італія), Г. Філдынга і Р. Шэрыдана (Англія), Г. Э. Лесінга (Германія). У канцы 19 ст. ўзнікла т. зв. «камедыя ідэй», моцная вострай крытыкай капіталіст. свету (Б. Шоў). У 20 ст. развіваецца трагікамедыя з глыбокім усведамленнем недасканаласці бурж. рэчаіснасці (Б. Брэхт, Э. Дэ Філіпа, Ф. Дзюрэнмат). З пачатку станаўлення (2-я пал. 18 ст.) рус. К. мела грамадз. сатыр. характар (творы В. Капніста, І. Крылова, Дз. Фанвізіна). У 19 ст. расквітнела рэаліст. сатыр. К., якая ўзнялася да крытыкі асноў самадзярж. ладу Расіі (А. Грыбаедаў, М. Гогаль, А. Астроўскі, А. Сухаво-Кабылін, М. Салтыкоў-Шчадрын, Л. Талстой). На мяжы 19—20 ст. гуманіст. і рэаліст. традыцыі рус. К. развіваў А. Чэхаў. Узоры рус. сав. К. стварылі У. Маякоўскі, Б. Рамашоў, В. Гусеў, В. Шкваркін, М. Зошчанка, Я. Шварц, С. Міхалкоў, В. Розаў, А. Сафронаў і інш. Сярод драматургаў народаў СССР у жанры К. вылучаюцца А. Карняйчук, І. Качарга, І. Мікітэнка, Ш. Дадыяні, М. Бараташвілі, А. Кахар і інш.

Станаўленне бел. К. адбывалася ў 19 ст. на аснове фальклору (абрадавая паэзія, нар. жарты, гумарыст. казкі) і традыцый нар. драматургіі, батлейкі, інтэрмедыі, школьнай драмы («Камедыя» К. Марашэўскага). Камедыі «Сельская ідылія» і «Залёты», фарс-вадэвіль «Пінская шляхта» В. Дуніна-Марцінкевіча вызначаліся вастрынёй камедыйнага сюжэту, дасціпнасцю дыялогу, багаццем мовы. На пач. 20 ст. К. Каганец у «Модным шляхцюку» выкрываў саслоўныя забабоны дробнай шляхты, сцвярджаў годнасць простага чалавека. Класічныя ўзоры бел. К.— камедыя «Паўлінка», вадэвіль «Прымакі» Я. Купалы, якім характэрны высокі гуманістычны пафас, сатырычная завостранасць і гумарыстычная дасціпнасць у паказе заганнага ў жыцці, выключная сцэнічнасць. У першыя гады Савецкай улады ў камедыйным жанры плённа працаваў У. Галубок («Пісаравы імяніны», «Пінская мадонна», «Суд» і інш.), яго сац.-бытавыя камедыі высмейвалі прадстаўнікоў самадзяржаўя, дарэвалюц. правінцыяльную «інтэлігенцыю», недахопы ў жыцці і побыце бел. сялянства дакастр. часу. У 20-я г. вядома сатыр. камедыя Е. Міровіча «Кар'ера таварыша Брызгаліна», накіраваная супраць ворагаў новага ладу, прайдзісветаў і бюракратаў. Вяршыня бел. сав. К.— сатыр. камедыі К. Крапівы «Хто смяецца апошнім» і «Мілы чалавек», якія вызначаюцца камедыйным майстэрствам, дынамізмам інтрыгі, завершанасцю сюжэту, псіхал. глыбінёй характараў, вострым выкрыццём прайдзісветаў, гарлахватаў, падхалімаў. Шырока вядомая К. «Несцерка» В. Вольскага, напісаная паводле фальклорных матываў. Папулярная К. пасляваеннага часу — «Пяюць жаваранкі» Крапівы. Значнае дасягненне бел. К. апошніх дзесяцігоддзяў — творчасць А. Макаёнка («Выбачайце, калі ласка!», «Каб людзі не журыліся», «Лявоніха на арбіце», «Зацюканы апостал», «Трыбунал»); яго камедыі вызначаюцца майстэрствам кампазіцыі, гуманіст. страснасцю, непрымірымасцю да любых праяў, варожых камуніст. маралі і прагрэсу. Найлепшыя камедыі Купалы, Крапівы, Макаёнка сталі набыткам усёй сав. драматургіі. Яны пастаўлены ў т-рах саюзных рэспублік і сацыяліст. краін (Балгарыя, Польшча, Чэхаславакія і інш.).

Літ.: Саннікаў А. К. Сатырычныя характары беларускіх камедый, Мн., 1961; Усікаў Я. К. Беларуская камедыя (ля вытокаў жанру), Мн., 1964; Сахновский-Панкеев В. А. О комедии, Л.— М., 1964; гл. таксама пры арт. *Драма.* *М. Р. Ярош.* Мінск.

КАМЕ́ДЫЯ ДЭЛЬ А́РТЭ (Commedia dell'arte), камедыя масак, від італьянскага тэатра сярэдзіны 16—18 ст., спектаклі якога ствараліся метадам імправізацыі на аснове



Сцэна з камедыі дэль артэ ў Італіі. 16 ст.

сцэнарыя (сюжэтная схема). Персанажамі былі тыповыя маскі, якія пераходзілі з аднаго спектакля ў другі. К. д. а.— найвышэйшае дасягненне італьян. т-ра эпохі Адраджэння, яна стала пач. развіцця еўрап. прафес. т-ра.

Буфонна яркія паказы К. д. а. на нар. дыялектах былі насычаны вулічнымі мелодыямі і песнямі, лацамі (трукамі), плебейскімі кпінамі, мелі сатыр. накіраванасць. Душой спектакля былі слугі — Брыгела, Арлекін, Каламбіна, Пульчынела і інш.; аб'ектам пастаяннай сатыры — купец Панталоне, дваранін Капітан, ілжэвучоны Доктар. Вядомыя акцёры К. д. а.— Ф. і І. Андрэіні (16 ст.), Дж. Б'янкалелі, Т. Ф'ярылі (17 ст.), А. Сакі (18 ст.). К. д. а. зрабіла ўплыў на фарміраванне нац. камед. драматургіі і сцэн. мастацтва інш. еўрап. краін (асабліва на драматургію К. Гальдоні, К. Гоцы, Мальера).

Літ.: Дживелегов А. К. Итальянская народная комедия, 2 изд., М., 1962.

КАМЕ́ЛІЯ (Camellia), род вечназялёных дрэў і кустоў сям. чайных. Вядома каля 60 відаў, пашыраных у тропіках і субтропіках Азіі. У СССР культывуюць 5 відаў у аранжарэях, пакоях, адкрытым грунце (Крым, Каўказ).



Камелія японская.

Расліны выш. 8—15 *м.* Лісце скурастае, пілаватае. Кветкі пазушныя, чырвоныя, ружовыя, белыя, стракатыя, простыя ці махрыстыя. Плод — касцянка, каробачка або ягада. Найб. пашырана К. японская (C. japonica), якая мае многа гібрыдных формаў. З некат. К. (К. алейная) атрымліваюць алей для касметыкі, зубалячэбнай практыкі, харч. прамысловасці. З насення К. японскай вырабляюць гліказід камелін.

Літ.: Киселев Г. Е. Цветоводство, 3 изд., М., 1964.

КАМЕ́ЛЬЧЫК Міхаіл Сцяпанавіч (н. 8.6. 1921, в. Бушмін Аршанскага пав. Віцебскай губ.), Герой Сав. Саюза (1946). З сялян. Чл. КПСС з 1944. Скончыў авіяшколу пілотаў (1941), Смаленскі пед. ін-т (1967). У Айч. вайну на Паўн.-Зах. і 1-м Бел. франтах — камандзір звяна штурмавога авіяпалка. Удзельнік вызвалення Ноўгарада, Пскова, Пінска, Любліна, Варшавы, Познані, баёў на Одэры, штурму Берліна. Зрабіў 100 баявых вылетаў, правёў 10 групавых паветр. баёў, знішчыў 84 варожыя аўтамашыны, 57 павозак і 23 вагоны з грузам, 39 гармат, 5 танкаў, бронетранспарцёр. З 1958 маёр К. у запасе. Ганаровы грамадзянін Познані. Жыве ў Смаленску.



КА́МЕНА, вёска ў Даўгінаўскім с/с Вілейскага р-на Мінскай вобл., на правым беразе р. Вілія. Да 1971 цэнтр калгаса «1 Мая». За 54 *км* на ПнУ ад Вілейкі, 110 *км* ад Мінска, 25 *км* ад чыг. ст. Крывічы, на аўтамаб. дарозе, якая злучае вёску з шашою Вілейка — Докшыцы. 338 ж., гасп. 105 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, магазін. У 1941 вёску спалілі ням.-фаш. захопнікі. Помнік на магіле партызан Вял. Айч. вайны.

КА́МЕНА, вёска ў Лагойскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Кастрычніцкі». За 42 *км* на ПнУ ад Лагойска, 82 *км* ад Мінска, 44 *км* ад чыг. ст. Барысаў, на аўтамаб. дарозе г. п. Плешчаніцы — в. Зембін. 404 ж., двароў 116 (1971). Лясніцтва, швейная і шавецкая майстэрні. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, сталовая, 2 магазіны. У 1944 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі. 2 помнікі: на брацкай магіле сав. воінаў і 303 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

КАМЕНДА́НЦКАЯ СЛУ́ЖБА, сукупнасць мерапрыемстваў, якія ажыццяўляюцца для падтрымання агульнага парадку ў раёнах размяшчэння падраздзяленняў і часцей, рэгулявання руху і кантролю за захаваннем войскамі мер маскіроўкі. Арганізоўваецца штабамі, якія вылучаюць для гэтага неабходныя сілы і сродкі, назначаюць камендантаў перапраў, маршрутаў і інш.

КАМЕНЕАПРАЦО́ЎКА, паданне прыроднаму каменю вызначанай формы і вонкавай аддзелкі. Працэс уключае прыблізную, дакладную і фактурную апрацоўку.

Прыблізнае К.— расколванне і абколванне каменя, каб атрымаць грубыя формы дэталі. Дакладнае К. цалкам выдаўляе памеры і форму вырабу. Фактурнае надае каменю шліфаваную, паліраваную ці шурпатую фактуру. Падаляецца на ўдарную апрацоўку і апрацоўку рэзаннем. Ударнае робіцца спец. стальнымі інструментамі (шпунт, зубіла, траянка, бучарда). Фактура пры ўдарнай К. кропкавая, рыфленая, баразнаватая, тыпу «скала». К. рэзаннем выконваецца абразівамі, абразіўнымі (шарошкі, кругі) і стальнымі інструментамі (разцы). У якасці абразіўных матэрыялаў выкарыстоўваюцца таксама алмазы. Абразіўныя фактуры: пілаваная, шліфаваная, глянцаваная, люстраная. К. бывае пескаструменнае для ачысткі фасадаў і выканання надпісаў, хімічная — для вырабу неглыбокіх арнаментаў і выпраўлення прыродных дэфектаў каменя. Пашыраецца тэрмічны спосаб К., заснаваны на дзеянні высокатэмпературнага струменю газу на пароду.

Літ.: Блохин Б. Н. и Галактионов А. А. Отделочные материалы и работы, М., 1962; Строительные материалы, М., 1970. *І. М. Кедзіч.* Мінск.

КАМЕНЕЎ Сяргей Сяргеевіч [4(16).4.1881, Кіеў — 25.8.1936], савецкі ваенны дзеяч, камандарм 1-га рангу (1935). Чл. КПСС з 1930. З сям'і ваен. інжынера.



Скончыў Акадэмію Ген. штаба (1907). У арміі з 1898. Удзельнік 1-й сусв. вайны. Пасля Кастр. рэвалюцыі нач. штаба 3-й арміі на Зах. фронце. З 1918 у Чырв. Арміі, ваен. кіраўнік Невельскага р-на Зах. завесы, пам. галоўнага кіраўніка Зах. завесы, камандуючы Усх. фронту. З ліп. 1919 да крас. 1924 галоўнакамандуючы Узбр. Сіл рэспублікі, потым інспектар, нач. штаба, гал. інспектар, нач. Гал. ўпраўлення РСЧА. У 1927—34 нам. наркома па ваен. і марскіх справах і старшыні РВС СССР. З чэрв. 1934 нач. ППА СССР. Аўтар прац па ваен. гісторыі і ваен. майстэрстве. Чл. ВЦВК (1921—36) і ЦВК СССР (1923—36). Узнаг. ганаровай рэвалюц. зброяй (1921, 1922), 3 ордэнамі. Пахаваны на Краснай плошчы ў Маскве.

Тв.: Записки о гражданской войне и военном строительстве, М., 1963 (бібліягр.).

Літ.: История гражданской войны в СССР, т. 3—5, М., 1957—60; Полководцы гражданской войны, М., 1960 (Жизнь замечательных людей).

М. І. Каміскі. Мінск.

КАМЕНЕЎ Філімон Іванавіч [н. 2(15).1.1909, в. Сажнае Белгарадскага пав. Курскай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). З сялян. Чл. КПСС з 1942. На фронце з 1941. Вызначыўся на тэр. Віцебскай вобл. Камандзір мінаметнага разліку, парторг роты К. першы фарсіраваў Зах. Дзвіну каля в. Грынёва Сіроцінскага раёна, з групай воінаў выбіў ворага з траншэяў, адбіў контратаку. Жыве ў г. Зарайску Маск. вобл.

КАМЕНІЧЫ, вёска ў Асіповіцкім р-не Магілёўскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Новы шлях». За 35 *км* на ПнУ ад Асіповіч, 130 *км* ад Магілёва, 6 *км* ад чыг. ст. Градзянка, на аўтамаб. дарозе в. Свіслач — в. Лапічы. 402 ж., двароў 137 (1971). Лясніцтва, швейная майстэрня. Пач. школа, клуб, б-ка, дзіцячыя яслі-сад, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Вёску тройчы (студз. 1943, люты і май 1944) часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі, за перыяд акупацыі загубілі 25 мірных жыхароў.

КАМЕНКА, рака, правы прыток Іэледзі (бас. Нёмана). Даўж. 21 *км*. Цячэ ў Стаўбцоўскім р-не Мінскай вобл. Вадазбор (51 *км*²) размешчаны ў межах зах. схілаў Мінскага ўзв. Рэльеф — плоская раўніна, парэзаная асушальнымі канавамі. Жыўленне мяшанае. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 0,3 *м*³/*сек*. К.— водапрыёмнік пры асушэнні балотаў.

КАМЕНКА (Нурава), вёска ў Боркавіцкім с/с Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл., прыстань на правым беразе Зах. Дзвіны. Цэнтр калгаса імя Ільіча. За 28 *км* на ПдУ ад Верхнядзвінска, 139 *км* ад Віцебска, 15 *км* ад чыг. ст. Боркавічы, каля аўтамаб. дарогі Дзісна — Боркавічы (1,5 *км*). 197 ж., гасп. 67 (1971). Клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, вет. ўчастак, сталовая. Помнік У. І. Леніну.

КАМЕНКА, вёска ў Горскім с/с Горацкага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр калгаса «50 гадоў БССР». За 21 *км* на У ад Горак, 116 *км* ад Магілёва, 24 *км* ад чыг. ст. Пагодзіна. 198 ж., двароў 53 (1971). Сепаратарны пункт. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. У 1943 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі. Помнік 437 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

КАМЕНКА, вёска ў Каробчыцкім с/с Гродзенскага р-на. Цэнтр калгаса «Барацьбіт». За 8 *км* на ПдЗ ад Гродна. 272 ж., гасп. 90 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін.

КАМЕНКА, вёска ў Кармянскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 12 *км* на ПнЗ ад Кармы, 122 *км* ад Гомеля, 52 *км* ад чыг. ст. Рагачоў, на аўтамаб. дарозе, якая злучае вёску з Кармою. 411 ж., двароў 116 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў Айч. вайны.

КАМЕНКА, вёска ў Мазырскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Каменка». За 12 *км* на ПдЗ ад Мазыра, 145 *км* ад Гомеля, 6 *км* ад чыг. ст. Козенкі, каля аўтамаб. дарогі Мазыр — Лельчыцы (0,7 *км*). 515 ж., двароў 147 (1971). Мех. майстэрня. Сярэдняя школа, клуб, дзіцячы сад, урачэбная амбулаторыя, аддз. сувязі, сталовая, магазін. У ліп. 1943 ням.-фаш. захопнікі спалілі вёску.

КАМЕНКА, вёска ў Кашалёўскім с/с Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса «Усход». За 14 *км* на ПдЗ ад Навагрудка, 168 *км* ад Гродна, 13 *км* ад чыг. ст. Наваельня. 368 ж., гасп. 96 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. У канцы 1943 — пач. 1944 ням.-фаш. захопнікі часткова спалілі вёску. Брацкая магіла 18 землякоў, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

У 1873 каля К. знойдзены манетна-рэчавы скарб — 21 рымская манета 1—2 ст. н. э., 4 сярэб-



Каменны век I. Палеаліт: 1. Крамянёвы востраканечнік; в. Падлужжа Чачэрскага р-на. 2. Крамянёвае скрабло; в. Абідавічы Быхаўскага р-на (усе ў Дзярж. музеі БССР). 3. Крамянёвы клінок; в. Юравічы Калінкавіцкага р-на (Мазырскі краязнаўчы музей). 4. Арнаментаваная чурынга з іклаў маманта; в. Юравічы. 5. Упрыгожанні з рогу аленя і іклаў маманта; в. Юдзінава Бранскай вобл. 6. Пацеркі з ракавін кауры; в. Юдзінава. Мезаліт: 7. Касцяны дроцік; в. Гадзілавічы Рагачоўскага р-на. 8. Цясла з рогу аленя; в. Ваўкі Брэсцкага р-на. 9. Крамянёвая піка; в. Опаль Іванаўскага р-на. Неаліт: 10. Крамянёвая цясла; в. Журавель Чэрыкаўскага р-на. 11. Наканечнік дроціка з крэменю; в. Касцюкоўка Кармянскага р-на. 12. Наканечнік дроціка з крэменю; в. Вусце Аршанскага р-на. 13. Матыка з рогу лася; в. Лясная Слаўгарадскага р-на (усе ў Дзярж. музеі БССР). 14. Касцяныя наканечнікі стрэл; в. Асавец Бешанковіцкага р-на. 15. Сякера з рогу лася. Касцяное дзяржанне нажа; в. Асавец (усе ў Ін-це гісторыі АН БССР). 16. Наканечнік кап'я з крэменю; в. Мяжа Гарадоцкага р-на.



Каменны век II. 1. Касцяныя ўпрыгожанні і гарпун; в. Асавец. 2. Падвескі з зубоў жывёлы; в. Асавец. 3. Гліняныя грузілы; в. Асавец. 4. Бурштынавыя ўпрыгожанні; паселішча Крывіна (в. Галоўск Сеннен-скага р-на). 5. Крамянёвыя нажы; паселішча Лысая Гара (в. Кругліц Стаўбцоўскага р-на). 6. Фрагмент гаршка; в. Юравічы (усе ў Ін-це гісто-рыі АН БССР). 7. Крамянёвы наканечнік кап'я; паселішча Пхоў (музей школы, в. Юравічы). 8. Гліняны посуд; в. Асавец. 9. Касцяны амулет; паселішча Крывіна. 10. Кірка з рогу лася; паселішча Краснае Сяло (пас Краснасельскі Ваўкавыскага р-на). 11. Крамянёвая сякера; паселішч Краснае Сяло. 12. Рэшткі гаршка з антрапаморфнай фігуркай; в. Добры Бор Баранавіцкага р-на. 13. Крамянёвыя кап'ё і кінжал; в. Камен Пінскага р-на. 14. Фрагмент гаршка з кампазіцыяй «Паляванне»; пасе лішча Літвін каля в. Юравічы (усе ў Дзярж. музеі БССР).

раныя пярсцёнкі, тры з іх з прывескамі ў выглядзе сітца, шпількі, кавадла; пярсцёнак у краты і сярэбраная прадаўгаватая грыўня з зігзагападобным арнаментам. На У ад К. ў лесе больш за 20 курганоў эпохі Кіеўскай Русі. На Пд ад К. паселішча позняга этапа зарубінецкай культуры.

Літ.: Очерки по археологии Белоруссии, ч. 1, Мн., 1970, с. 180; Кропоткин В. В. О некоторых кладах римских монет, найденных в России, «Краткие сообщения о докладах и полевых исследованиях Института истории материальной культуры АН СССР», 1956, в. 66.

КАМЕНКА, вёска ў Уздзенскім р-не Мінскай вобл., на р. Уса. Цэнтр сельсавета. За 6 *км* на ПнЗ ад Узды, 64 *км* ад Мінска, 16 *км* ад чыг. ст. Негарэлае, на аўтамаб. дарозе Узда — Негарэлае. 330 ж., двароў 129 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт.

КАМЕНКА, вёска ў Благавіцкім с/с Чавускага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр калгаса «Ленінскі шлях». За 16 *км* на ПнЗ ад Чавусаў, 40 *км* ад Магілёва, 20 *км* ад чыг. ст. Чавусы. 149 ж., двароў 52 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, магазін. У 1941 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў Айч. вайны.

КАМЕНКА, вёска ў Шчучынскім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Пратасаўшчына». За 16 *км* на З ад Шчучына, 45 *км* ад Гродна, 19 *км* ад чыг. ст. Скідаль. 539 ж., гасп. 180 (1971). Швейная майстэрня. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, вет. пункт, аддз. сувязі, сталовая, 3 магазіны. У 1944 ням.-фаш. захопнікі часткова спалілі вёску. Помнік 8 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

КАМЕНКІ (Oenanthe), род птушак сям. дразду атр. *вераб'іных*. Пашыраны ў Еўропе, Азіі, Афрыцы, Паўн. Амерыцы. У СССР 8 відаў, на Беларусі 1 — звыч. К. (O. oenanthe).

У К., пашыраных у СССР, даўж. цела 15—18 *см*, маса 16—31 *г*. Апярэнне чорна-бела-шэрае. Дзюба тонкая, ногі дужыя з даўгаватаю цэўкаю. Звычайная К.— пералётная птушка. Гняздуецца на зямлі ў адкрытых, пераважна сухіх мясцінах (на палях, каля дарог, на голых лясных высечках). Нясе 4—8 яец. Корміцца беспазваночнымі жывёламі, ягадамі. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Птушкі*.

КАМЕННАВУГАЛЬНАЯ СМАЛА (коксавая смала, каменнавугальны дзёгаць), вязкая чорная вадкасць, якую атрымліваюць на коксахім. з-дах пры *каксаванні* каменнага вугалю. Выхад — каля 3% ад колькасці вугалю.

Хім. састаў — складаная сумесь цыклічных і гетэрацыклічных вуглевадародаў і іх вытворных. Перагонкай раздзяляюць на фракцыі (лёгкае масла, фенольную, нафталінавую і інш.) і пек (цвёрдае або густое, вязкае чорнае рэчыва). З вялікай колькасці кампанентаў К. с. больш як 100 маюць практ. значэнне: фенол, крэзолы, нафталін, антрацэн, карбазол, пірыдзін, хінолін. Яны з'яўляюцца сыравінаю ў вытв. фарбавальнікаў, пластмас, выбуховых і лекавых рэчываў. Пек выкарыстоўваецца ў дарожным буд-ве, у вытв. дахавых матэрыялаў.

Літ.: Брон Я. А. Переработка каменноугольной смолы, М., 1963 (бібліягр.).

КАМЕННАВУГАЛЬНЫ ПЕРЫЯД (СІСТЭМА), карбон, пяты перыяд палеазойскай эры ў гісторыі Зямлі, наступны за дэвонскім, папярэднічае пермскаму. Пачаўся 285 млн. гадоў назад, цягнуўся 65 млн. гадоў. Вылучаны англ. геолагамі У. Конібірам і У. Філіпсам у 1822. У СССР падзяляецца на ніжні, сярэдні і верхні аддзелы; у ніжнім вылучаюць турнейскі, візейскі і намюрскі ярусы; у сярэднім — башкірскі і маскоўскі; у верхнім — касімаўскі і гжэльскі.

Арган. свет у К. п. значна эвалюцыянаваў у параўнанні з дэвонскім перыядам. У морах пераважалі фарамініферы, гапілыты і брахіяподы (галоўныя групы арганізмаў пры вывучэнні стратыграфіі карбону). На сушы з'явілася мноства формаў хрыбетных (пераважна стэгацэфалы), гіганцкіх наскомых. Спрод раслін панавалі споравыя, даслягнулі росквіту дэвона і папараці. Зялёныя водарасці прэсных водаў з'явіліся матэрыялам для ўтварэння сапрапелевых вугалёў і гаручых сланцаў, а гіганцкія наземныя расліны (лепідадэндраны, каламіты, сігілярыі і інш.) у прыбярэжных азёрах і балотах ва ўмовах вільготнага цёплага клімату ўтварылі буйныя радовішчы кам. вугалю. З адкладамі К. п. на Зямлі звязаны таксама радовішчы нафты і газу, жалеза, каляровых і высакародных металаў, каштоўных камянёў і інш. У верхнім карбоне клімат на Зямлі змяніўся, адбылося значнае абледзяненне *Гандваны*.

У БССР адклады карбону трапляюцца пераважна ў Прыпяцкай упадзіне. Залягаюць амаль усюды на адкладах верхняга дэвону (у паўд. ч. ўпадзіны на пародах крышт. фундаменту) і перакрываюцца асадкавай тоўшчай пярмі і трыясу. Магутнасць ад некалькіх метраў (на купалах) да 1000 *м* і больш (у міжкупальных паглыбленнях). Прадстаўлены ніжнім і сярэднім аддзеламі (у найб. паглыбленых участках некаторыя даследчыкі ўмоўна вылучаюць маламагутныя адклады верхняга аддзела). Складзены з пясчана-глініста-мергельных парод з праслоямі вапнякоў, даламітаў і бурых вугалёў. У адкладах ніжняга карбону трапляюцца праслойкі баксітавых парод. Фарміраванне тоўшчы парод у К. п. на Беларусі адбывалася пераважна ў марскіх умовах. Змена марскіх і кантынентальных умоў у К. п. звязана з тэктанічнымі рухамі *герцынскай складкавасці*. У канцы маскоўскага веку ўсл тэр. Беларусі як частка Усх.-Еўрап. платформы ператв. ў сушу.

Літ.: Стратиграфические схемы палеозойских отложений. Каменноугольная система, М., 1962; Геологическое строение СССР, т. 1, М., 1968; Голубцов В. К. и Махнач А. С. Фации территории Белоруссии в палеозое и раннем мезозое, Мн., 1961. *Г. А. Белавусава.* Мінск.

КАМЕННАЕ ЛІЦЦЁ, паштучныя вырабы (адліўкі) з расплаваў горных парод, металургічных шлакаў ці спец. неметалічнай шыхты. У залежнасці ад сыравіны адрозніваюць чорнакаменнае, белакаменнае ліццё (адліўкі) і вырабы з металургічных шлакаў.

Чорнакаменнае атрымліваюць пераплаўкаю пры 1350—1450 °С дылбазу ці базальту з дабаўкаю 10% гарыбленіту і 2% хромістага жалезняку (бываюць і інш. саставы). Белакаменнае атрымліваюць з расплаву сумесі кварцу, вапны, даламіту. Дабаўка вокіслаў металаў дае магчымасць адліваць каменныя вырабы розных афарбовак. К. л. робяць таксама з шлакаў медна-нікелевай вытворчасці. К. л. адрозніваецца зносаўстойлівасцю, тэрмастойкасцю, хім. устойлівасцю да кіслот і інш. Найб. пашыраны вырабы: трубы для пнеўма- і гідратранспарту, пліты на падлогу, блокі на муроўку хім. апаратаў.

Літ.: Вагин В. В. и Пирогов Б. И. Каменное литье, М., 1962; Липовский И. Е. и Дорофеев В. А. Камнелитейное производство, М., 1965; Хан В. Х. и Быков И. И. Производство и применение каменного литья, Киев, 1968.

КАМЕННАЯ РУСОТА, вёска ў Гожскім с/с Гродзенскага р-на. Цэнтр саўгаса «30 гадоў БССР». За 7 *км* на ПнУ ад Гродна. 133 ж., гасп. 40 (1971). Б-ка, аддз. сувязі, магазін.

КАМЕННАЯ СОЛЬ (галіт), мінерал класа галоідаў, хлорысты натрый NaCl. К. с. называюць і асадкавую хемагенную горную пароду, складзеную пераважна з галіту, з прымесямі сульфатнага (ангідрыт, гіпс), карбанатнага (кальцыт, даламіт і інш.), гліністага і алеўрытавага матэрыялу, калійных соляў, зрэдку бітумнага рэчыва. К. с. выкарыстоўваюцца для атрымання спажыўной солі, у хім. прамысловасці.

К. с. крышталізуецца ў кубічнай сістэме. Звычайна ўтварае зярністыя масы. У чыстым выглядзе К. с. бясколерная і празрыстая, прымесямі афарбаваная ў жоўты, шэры, аранжавы, чырвоны, сіні і інш. колеры. Бляск шкляны. Цв. 2,0; шчыльн. 2100—2200 *кг/м*³. Утвараецца ва ўмовах сухога клімату, пры выпарэнні марской вады. Залягае слаямі ці штокамі. Вядома ў адкладах розных геал. эпох. Магутныя паклады К. с. верхнедэвонскага ўзросту выяўлены на Беларусі ў Прыпяцкай упадзіне — Старобінскае, Мазырскае і Давыдаўскае радовішчы (гл. адпаведныя арт.). У СССР К. с. вядомы таксама ў Паволжы, Данецкім бас., на Урале, у Сібіры, Сярэдняй Азіі і інш.; за мяжою — у Польшчы, ГДР, ФРГ, ЗША і інш.

Літ.: Гл. пры арт. *Галагенная фармацыя, Калійныя солі.* *В. З. Кіслік.* Мінск.

КАМЕННЫ БАРОК, вёска ў Бярэзінскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 22 *км* на ПдУ ад г. Бераэіно, 125 *км* ад Мінска, 27 *км* ад чыг. ст. Нясета, на аўтамаб. дарозе г. Бераэіно — г. п. Клічаў. 290 ж., двароў 103 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін.

КАМЕННЫ ВЕК, самая стараж. эпоха археалагічнай перыядызацыі, перыяд гісторыі і культуры, на працягу якога прылады працы і зброя выраблялiся з каменю, часткова з косці і дрэва. [На ўклейках: карта і ілюстрацыі (укл. I—II)].

К. в.— самая працяглая эпоха ў гісторыі чалавецтва, пачалася 1,5—1 млн. гадоў назад, калі чалавек вылучыўся з жывёльнага свету, і закончылася 6—4 тыс. гадоў назад, калі чалавек стаў карыстацца метал. прыладамі. Падзяляецца на старажытны К. в., або палеаліт, сярэдні К. в., або мезаліт, і новы К. в., або неаліт. Палеаліт падзяляецца на ніжні, або ранні, сярэдні, верхні, або позні. Да ніжняга палеаліту адносяцца дашэльская культура, *шэльская культура* і *ашэльская культура*; да сярэдняга — *мусцьерская культура*, да верхняга — *арыньякская культура, салютрэйская культура, мадленская культура*. У ніжнім палеаліце (больш за 800 тыс. гадоў назад) жылі людзі самай стараж. стадыі развіцця (*пітэкантрап, сінантрап, атлантрап, гейдэльбергскі чалавек*), карысталіся абабітымі каменнымі прыладамі працы — масіўнымі рубілам, адшчэпамі і інш., займаліся паляваннем і збіральніцтвам. У мусцьерскую эпоху (100—40 тыс. гадоў назад) паявіліся *неандэртальцы*, якія жылі ў ледавіковы перыяд, карысталіся трохвугольнымі вастраканечнікамі, авальнымі скрэблам, пласцінкавымі крамянёвымі прыладамі, каспянымі вырабамі, навучыліся здабываць агонь і будаваць жытло. Адбываўся пераход ад першабытнастаткавай грамады да родавага ладу: чалавек ператварыўся ў сацыяльную істоту. Узніклі прымітыўныя рэліг. вераванні. У верхнім палеаліце (40—10 тыс. гадоў назад) паявіўся чалавек сучаснага фіз. тыпу (Homo sapiens) і прыметы 3 расавых тыпаў: еўрапеоіднага *(краманьёнцы)*, манголоіднага і негроіднага *(грымальдзійцы)*. Верхнепалеалітычным культурам характэрны прызматычныя нуклеўсы, ад якіх адколваліся ножападобныя крамянёвыя пласцінкі і з іх выраблялiся скрабкі, вастрыі, наканечнікі, разцы, праколкі і інш., прылады з косці, рагоў, ілаў мамонта. На сценах у пячорах зберагліся наскальныя малюнкі (гл. *Альтаміра*). Паступова людзі засялялі Урал, Сібір, праніклі ў Амерыку. Узніклі вялікія вобласці, якія адрозніваліся культурнымі традыцыямі: еўрап. прыледавіковая вобласць, насельніцтва якой жыло ў халодных клімат. умовах, паляванне на мамантаў і паўн. алешяў, будавала наземныя жытлы з касцей мамантаў і шкур; сібірская вобласць — жыхары апрацоўвалі дрэва і карысталіся масіўнымі грубаапрацаванымі каменнымі прыладамі; афрыканска-міжземнаморская вобласць — насельніцтва жыло ў цёплых клімат. умовах, займалася пераважна збіральніцтвам, карысталася лукам і стрэламі, мікралітычнымі крамянёвымі ўкладышамі. Пераход да мезаліту супадае з пачаткам *галацэну* і заканчэннем ледавіковага перыяду. У мезаліце (8—5 тыс. гадоў да н. э.) пашырыліся макраліты — масіўныя, грубаабабітыя прылады працы, якія служылі сякерамі, цёсламі, кіркамі; мікраліты — дробныя каменныя прылады, якія ўжываліся як наканечнікі стрэл ці як лязо драўляных, касцяных прылад. Плямёны мезалітычнай эпохі карысталіся рэчамі з рагавой або касцяной асновай, з муфтамі і ручкамі з крамянёвымі і касцянымі ўстаўкамі, лукам і стрэламі, сякерамі і цёсламі, паляваді з прыручанымі сабакамі. Неалітычныя плямёны шліхтаваннем і свідраваннем рабілі каменныя сякеры, долаты, цёслы, матыкі, кінжалы, сярпы, прылады з рогу, косці і дрэва. У неаліце паляўляецца гліняны посуд, пашыраецца прадзенне і ткацтва, зараджаецца земляробства і жывёлагадоўля, якія месцамі выцеснілі паляванне, рыбалоўства і збіральніцтва. Развіццё вытворчых формаў гаспадаркі вяло да расшырэння прымітыўных менавых адносін. Неаліт — эпоха росквіту мацярынскага родавага ладу.

У СССР стаянкі чалавека шэльскай культуры выяўлены ў Закаўказзі (Кударо, Яштух, Сатані-Дар), на Днястры (Лука-Врублявецкая), мусцьерскай культуры ў Крыме (пячоры Старасселле, *Кіік-Каба*), Узбекістане, Прыкарпацці, каля Жытоміра, Бранска і інш. Верхнепалеалітычныя стаянкі адкрыты ў Касцёнках, Мезіне, Мальце, Аўдзееве, *Елісеевічах, Юдзінаве*, Цімнаўцы. У мезаліце ў усх. Еўропе пашыраны *дзяснінская культура*, верхняволжская, мікралітычная і інш. культуры, на тэр. Польшчы камарніцкая, янславіцкая, майданаўская культуры, у Прыбалтыцы *свідэрская культура, Маглемазэ культура*. У эпоху неаліту вядомы бужска-днястроўская, сурская, *волга-окская культура*, льялаўская, карэльская і інш. культуры.

Аб пранікненні чалавека на тэр. Беларусі ў мусцьерскую эпоху сведчаць прылады працы, знойдзеныя каля Свяцілавіч (Веткаўскі р-н) і *Абідавіч* (Быхаўскі р-н). Падобныя рэчы з адшчэпамі і дыскападобнымі нуклеўсамі разам з касцямі маманта выяўлены каля в. *Клеявічы* (Касцюковіцкі р-н), *Падлужжа* (Чачэрскі р-н). Рэшткі верхнепалеалітычных паселішчаў выяўлены каля в. *Бердыж, Юравічы* (26—22 тысячагоддзі да н. э.). Больш помнікаў канца палеаліту: *Грэнск*, Падлужжа (Чачэрскі р-н), Арэхава (Маларыцкі р-н), Бабровічы (Іванцэвіцкі р-н), *Чарэшля*, *Свіцязь* (Навагрудскі р-н), Грандзічы (Гродзенскі р-н), *Крумплева* (Дзісненскі р-н) і інш. У эпоху мезаліту на ПнУ ад Друці і Беседзі жылі плямёны, якія выраблялі макралітычныя прылады працы (*Журавель*, Аношкі Кармянскага р-на, Гайкоўка Касцюковіцкага р-на, *Латкі, Крыжы*). У вярхоўях Прыпяці і Панямоння жыло насельніцтва, якое выраблялa макрамікралітычныя або макралітычныя прылады працы (Грандзічы, *Збляны*, Свіцязь, Чарэшля). На ПдУ, ПдЗ і Пн тэр. Беларусі жылі плямёны, якія выраблялі мікралітычныя прылады (*Беласарока*, Ражава Нараўлянскага р-на, Юравічы, *Дарашэвічы*, Міраслаўка Бярэзінскага р-на, *Сямёнаў Хутар* Полацкага р-на, *Стаўбун* Веткаўскага р-на). У эпоху неаліту на ПдУ жылі плямёны *грабеньчата-накольчатай керамікі культуры*. У вярхоўях Прыпяці і ў Панямонні — *нёманскай куль-*

туры, на У верхнедняпроўскай культуры, у Паазер'і насельніцтва, блізкае да плямёнаў нарвенскай культуры (*Крывіна, Асавец 2-й* і інш.). На Пн Беларусі праніклі плямёны тыповай грабеньчата-ямкавай керамікі і змяшаліся з мясцовым насельніцтвам. У пач. 2-га тысячагоддзя да н. э. на тэр. Беларусі паселіліся плямёны *шнуравой керамікі культуры*; іх узаемасувязі з мясцовым насельніцтвам прывялі да фарміравання розных культур бронзавага веку і канчатковага пашырэння вытворчай гаспадаркі.

Літ.: Энгельс Ф. Паходжанне сям'і, прыватнай уласнасці і дзяржавы, Маркс К. і Энгельс Ф. Выбраныя творы, т. 2, Мн., 1952; Брюсов А. Я. Очерки по истории племен Европейской части СССР в неолитическую эпоху, М., 1952; Будько В. Д. Памятники свидерско-гренской культуры на территории Белоруссии, у кн.: У истоков древних культур (эпоха мезолита), М.— Л., 1966 (Материалы и исследования по археологии СССР, № 126); Гурина Н. Н. Новые данные о каменном веке северо-западной Белоруссии, у кн.: Палеолит и неолит СССР, т. 5, М.— Л., 1965 (там жа, № 131); Ефименко П. П. Первобытное общество, 3 изд., Киев, 1953; Поликарпович К. М. Палеолит Верхнего Поднепровья, Мн., 1968; Очерки по археологии Белоруссии, ч. 1, Мн., 1970; Материалы по археологии БССР, т. 1, Мн., 1957; Каменный век на территории СССР, М., 1970; Исаенко В. Ф. Археологическая карта Белоруссии, в. 1 — Памятники каменного века, Мн., 1968; Яго ж. Каменный век Белоруссии в свете нового исследования Полесья, у кн.: Древности Белоруссии, Мн., 1969; Чернявский М. М. Некоторые черты неолита Белорусского Понеманья, у кн.: Вопросы истории и археологии, Мн., 1966; Яго ж. Исследование неолитических поселений Кривинского торфяника, у кн.: Древности Белоруссии, Мн., 1969. *У. Ф. Ісаенка, М. М. Чарняўскі.* Мінск.

КАМЕННЫ ВУГАЛЬ, цвёрдая асадкавая горная парода расліннага паходжання. Больш высокай ступені вуглефікацыі, чым буры вугаль. Складзены з прадуктаў глыбокага распаду і змены рэштак раслін без доступу паветра пры ўдзеле мікраарганізмаў і вады ва ўмовах вялікага ціску і высокай т-ры. Форма залягання пераважна пластавая. Адзін з асн. відаў энерг. паліва і металург. сыравіна. К. в. складаюць каля 65—70% агульных запасаў вугалю ў СССР, з іх каля 26% каксуюцца (гл. *Каксаванне*). На Беларусі маламагутныя (да 0,2 *м*) праслойкі К. в. выяўлены ў Брэсцкай упадзіне ў адкладах візейскага яруса каменнавугальнай сістэмы. Гл. таксама *Вугалі выкапнёвыя, Вугальная прамысловасць.*

К. в. змяшчае 75—97% вугляроду, 2—5,5 вадароду, 1,5—16% кіслароду, мінер. прымесей — крамянёзёму, гліністага рэчыва і інш. ад 1—2% і больш. Апошнія пры агаранні К. в. вызначаюць яго попельнасць. Выхад лятучых кампанентаў (на гаральную масу) 2—45%, цеплатворная здольнасць (7—8,5) · 4,19 · 10⁶ *дж/кг* (7—8,5 тыс. *ккал/кг*), зрэдку большая. Колер чорна-шэры, чорны. Шчыльн. 1220—1340 *кг/м*³. Састаўныя кампаненты К. в. (інгрэдыенты) — вітрэн, кларэн, дзюрэн і фюзен — розняцца фіз. і хім. ўласцівасцямі. Паводле бляску вылучаюць К. в. бліскучыя, складзеныя з вітрэну і кларэну, і матавыя — з дзюрэну і фюзену. Паводле ступені вуглефікацыі (выхаду лятучых кампанентаў, хім. саставу, цеплыні згарання, шчыльнасці) К. в. падзяляецца на класы, якія адпавядаюць маркам вугалёў: даўгаполымныя, газавыя, тлустыя, коксавыя, абедненыя коксавыя, бедныя спякальныя, бедныя, паўантрацыты і *антрацыты*.

Літ.: Аммосов И. И. и др. Промышленно-генетическая классификация углей СССР, М., 1964; Матвеев А. К. Геология угольных бассейнов и месторождений СССР, М., 1960; Яго ж. Угольные месторождения зарубежных стран, М., 1966; гл. таксама пры арт. *Вугалі выкапнёвыя.* *Л. Ф. Ажгірэвіч.* Мінск.

КАМЕННЫ ЛОГ, вёска ў Ашмянскім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Ураджай». За 17 *км* на ПнЗ ад Ашмян, 238 *км* ад Гродна, 37 *км* ад чыг. ст. Ашмяны, каля аўтамаб. дарогі Ашмяны — Вільнюс (0,5 *км*). 187 ж., гасп. 55 (1971). Клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, вет. пункт, аддз. сувязі, магазін. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

КАМЕННЫЯ БАБЫ, назва стараж. каменных скульптур з вапняку, пясчаніку і інш. цвёрдых парод вышынёю ад 1 да 4 *м*, якія былі пашраны з скіфскай (5—4 ст. да н. э.) да познакачэўніцкай пары (13—14 ст.) у стэпах Еўропы і Азіі (ад Прыкарпацця да Манголіі, у т. л. ў стэпах Крыма і Паўн. Каўказа).

Асабліва характэрны народам цюркскамоўнай групы. К. б., магчыма, уяўлялі памерлых правадыроў, жрацоў, жрыц і інш., іх узнікненне звязваюць з культам продкаў. К. б. часам трапляюцца на тэр. Беларусі. Некаторыя з іх, напэўна, прывезены ў 19 ст. памешчыкамі для сваіх маёнткаў.

Літ.: Мялешка М. Камень у вераньях і паданнях беларуса, Мн., 1929; Грач А. Д. Древнетюркские изваяния Тувы, М., 1961.

КАМЕННЫЯ БУДАЎНІЧЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ, прыродныя ці штучныя матэрыялы, выкарыстоўваюць з масіву каменярэзнымі машынамі. На муроўку невысокіх сцен і фундаментаў ужываюць бутавы камень (бут), які звычайна не мае правільнай формы (вапняк, граніт, даламіт, пясчанік). Матэрыял для вонкавай і ўнутр. аблiцовак сцен, прыступкі, пліты на падлогу і розныя арх.-буд. дэталі робяць з распілаванага граніту, мармуру, вапняку. Дахавыя пліткі выраблiваюць з марозаўстойлівых сланцаў і пясчанікаў, колючы іх па слаях. Дарогі будуюць з брусчаткі, каменю, тратуарных плітак, якія робяць пераважна з цвёрдых парод (граніт, дыярыт). Гл. таксама *Каменеапрацоўка, Будаўнічыя матэрыялы.*

КАМЕННЫЯ КУРГАНЫ, разнавіднасць *курганоў*, пахавальныя збудаванні зах. балцкіх плямёнаў (1-е тысячагоддзе да н. э.— 13 ст. н. э.). Насыпаны цалкам з каменю або ў якіх камень займае значнае месца. Мелі паўкруглую плоскую форму дыяметрам 6—18 *м*, вышынёю 0,5—0,8 *м*. Пашраны ў Верхнім і Сярэднім Панямонні, сярэднім цячэнні Бога. Даследавалі М. П. Авенарыус, Э. А. Вольтэр, В. Шукевіч, М. А. Янчук (канец 19 — пач. 20 ст.), І. В. Біруля, У. Антаневіч, Я. Ясканіс (20 ст.) і інш. Пахавальныя абрады — трупаспаленне і трупапалажэнне. Пры раскопках знойдзены коп'і, сякеры, спражкі, шпоры, цуглі, грыўні шыйныя, фібулы, пацеркі. У К. к. 11—13 ст. жалезныя прылады працы і зброя, упрыгожанні слав. і балцкага тыпаў, слав. кераміка і інш., што сведчыць аб працэсе славянізацыі балцкіх плямёнаў.

Літ.: Седов В. В. Курганы ятвягов, «Советская археология», 1964, № 4. *П. Ф. Лысенка.* Мінск.

КАМЕ́ННЫЯ ЛА́ВЫ, вёска ў Шклоўскім р-не Магілёўскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Перамога». За 15 км на Пд ад Шклова, 21 км ад Магілёва, 1 км ад чыг. ст. Лотва. 367 ж., двароў 181 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі, магазін. У 1944 вёску спалілі ням.-фаш. захопнікі.

КАМЕ́ННЫЯ МАГІ́ЛЫ, паўшарападобныя, прадаўгаватыя ці прамавугольныя каменныя пахавальныя збудаванні. Пашыраны на правабярэжжы Нёмана (*Вензайшчына, Дварчаны*, Ланкішкі, Пузелі, Салапяцішкі, Чарнішкі і інш.), сустракаюцца ў суседніх р-нах Польшчы; у Ноўгарадскай і Пскоўскай абл. падобныя пахаванні называюцца *жальнікамі*.

Даследаваліся В. Шукевічам і Э. А. Вольтэрам у канцы 19 — пач. 20 ст. Пахаванні адзіночныя і калектыўныя. Нябожчыкаў хавалі ў грунтавых магілах галавою пераважна на З. У мужчынскіх пахаваннях трапляюцца прылады працы, у жаночых — упрыгожанні. Найб. ранніх К. м. адносяцца да 13—14 ст., магчыма нават да 12 ст.

Літ.: Гуревич Ф. Д. Древности Белорусского Понеманья, М.— Л., 1962. *Я. Г. Звяруга.* Мінск.

КАМЕНСКАЕ ГАРАДЗІШЧА, рэшткі скіфскага ўмацаванага паселішча канца 5—3 ст. да н. э. каля г. Каменка-Дняпроўская Запарожскай вобл. Даследавалася Д. Я. Сердзюковым (1899—1900) і Б. М. Гракавым (1938—41, 1944—50).

Выяўленыя знаходкі сведчаць пра тое, што жыхары К. г. займаліся здабычай і апрацоўкай жалеза, вырабам жал. і бронзавых рэчаў, ганчарствам, ткацтвам, земляробствам, жывёлагадоўляй і інш., жылі ў зямлянках і наземных жытлах слупавой канструкцыі. У паўд.-зах. частцы размяшчаліся цытадэль і адначасова акропаль. К. г. было буйным рамесным і гандлёвым цэнтрам, які меў сувязі з грэч. гарадамі Паўн. Прычарнамор'я і мясцовым насельніцтвам, у т. л. з плямёнамі мілаградскай культуры.

Літ.: Граков Б. Н. Каменское городище на Днепре, М., 1954 (Материалы и исследования по археологии СССР, № 36).

КАМЕ́НСКАЯ Антаніна Георгіеўна [н. 22.4 (5.5).1917, Растоў-на-Доне], руская савецкая актрыса. Засл. арт. БССР (1963). Чл. КПСС з 1951. Скончыла Растоўскае тэатр. вучылішча (1935). У 1936—58 працавала ў т-рах Растова-на-Доне. З 1958 у Гомельскім драм. т-ры. Характарная актрыса. Лепшыя ролі: Паўліна, Карміліца («Зімовая казка», «Рамэо і Джульета» У. Шэкспіра), Мамаева («На ўсякага мудраца хапае прастаты» А. Астроўскага), Алена («Мяшчане» М. Горкага), мадам Ксідыяс («Інтэрвенцыя» Л. Славіна), Тэрэза («Дзень нараджэння Тэрэзы» Г. Мдывані), Баярынава («Мана для вузкага кола» А. Салынскага), Марыя Васілеўна («Жыццё ўсяго адно» А. Маўзона).

КАМЕ́НСКАЯ Ніна Васілеўна [н. 28.12.1913(10.1.1914), мяст. Асіповічы Бабруйскага пав. Мінскай губ.], беларускі савецкі гісторык. Чл.-кар. АН БССР (1959), д-р гістар. н. (1958), праф. (1961). З рабочых. Чл. КПСС з 1942. Скончыла Магілёўскі пед. ін-т (1937). З 1944 старшы навук. супрацоўнік, заг. сектара, нам. дырэктара Ін-та гісторыі АН БССР. З 1962 дырэктар Ін-та гісторыі партыі пры ЦК КПБ, з 1965 — Ін-та гісторыі АН БССР. З 1969 прарэктар, з 1971 заг. кафедры гісторыі БССР Мінскага пед. ін-та імя М. Горкага. Працуе над праблемамі гісторыі Кастр. рэвалюцыі і грамада. вайны на Беларусі і ўтварэння БССР. Адна з аўтараў і рэдактараў прац «Нарысы гісторыі Камуністычнай партыі Беларусі» (ч. 1, 1961, 2 выд., 1968), «Гісторыя Беларускай ССР» (т. 2, 1958, 2 выд., 1961), «Гісторыя Мінска» (1957, 2 выд., 1967), «Перамога Савецкай улады ў Беларусі» (1967) і інш. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.



Тв.: Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя і ўтварэнне БССР, Мн., 1954; Первые социалистические преобразования в Белоруссии, Мн., 1957; Белорусский народ в борьбе за Советскую власть, Мн., 1963; (разам з М. Я. Шкляром) Боевой отряд КПСС, Мн., 1963.

КАМЕ́НСКІ Анатоль Сяргеевіч [н. 3(16).10. 1912, Растоў-на-Доне], рускі савецкі акцёр. Засл. арт. БССР (1963). Чл. КПСС з 1951. Скончыў Растоўскае тэатр. вучылішча (1937). У 1937—58 працаваў у т-рах Растова-на-Доне. З 1958 у Гомельскім драм. т-ры. Выканаўца характарных, камед. роляў. Сярод лепшых: Аўталік («Зімовая казка» У. Шэкспіра), Рабінзон («Беспасажніца» А. Астроўскага), Пярчыхін («Мяшчане» М. Горкага), Ібрагім-аглы («Угрум-рака» паводле В. Шышкова), Фількаанархіст («Інтэрвенцыя» Л. Славіна), Намура («Прэс-аташэ з Токіо» М. Маклярскага і К. Рапапорта), дзед Цярэшка («Рудабельская рэспубліка» паводле С. Грахоўскага).

КАМЕ́НСКІ Антон Іосіфавіч (21.7.1860, Вільня — 12.9.1933), беларускі і польскі графік і жывапісец. Вучыўся ў Пецярбургскай АМ

А. І. Каменскі. Беларусачка. З серыі «Белавежская пушча». Літаграфія. 1910 (злева). Мітынг. З серыі «Дух рэвалюцыянера». Літаграфія.



(1882—85) у Б. Вілевальдэ. У 1885—90 жыў у родавым маёнтку Ярылаўка (Гродзенская губ.). З 1891 у Парыжы, вучыўся ў акадэміі Жульена. Вярнуўшыся на радзіму (канец 90-х г.), супрацоўнічаў у варшаўскіх і віленскіх часопісах, рабіў іл. да твораў рус. і польскіх пісьменнікаў (у т. л. Э. Ажэшкі). Стварыў шэраг партрэтаў, серыі літаграфій: з жыцця беларусаў — «Белавежская пушча» (1910), «Дух рэвалюцыянера» (на тэмы рэвалюцыі 1905). Сярод малюнкаў — «Сход рускай сацыяліст. моладзі» (1891). *Л. Н. Дробаў.* Мінск.

КАМЕ́НСКІ Уладзімір Георгіевіч [н. 29.6 (12.7).1909, с. Нікольскае Звенігародскага пав. Маскоўскай губ.], беларускі савецкі вучоны ў галіне будаўніцтва, дзярж. дзеяч БССР. Д-р тэхн. н. (1965). Чл. КПСС з 1929. З рабочых. У 1935 скончыў Бел. політэхн. ін-т. У 1935—39 нач. аддзелаў наркамата мясцовай прамысловасці БССР; у 1939—41 на парт. і сав. рабоце. Удзельнік Айч. вайны. Нач. Галоўнага ўпраўлення прамысл. буд-ва пры Савеце Міністраў БССР (1946—53). Міністр жыллёва-грамадзянскага буд-ва, міністр гарадскога і сельскага буд-ва БССР (1953—55). У 1955—70 нам. старшыні Савета Міністраў БССР. З 1970 заг. лабараторыі электратэрмічных працэсаў Ін-та цепла- і масаабмену АН БССР. Навук. працы па даследаванні цеплаахоўных і цеплавільготнасных уласцівасцяў сценавых канструкцый жылых і грамадзянскіх будынкаў. На XIX з'ездзе КПБ выбіраўся чл. Рэвізійнай камісіі, на XX—XXI з'ездах — канд. у чл. ЦК, на XXII, XXIV—XXVI з'ездах — чл. ЦК. Чл. бюро ЦК КПБ па кіраўніцтве прамысловасцю (1963—64). Дэп. Вярх. Савета БССР 2—7-га скл. Узнаг. 6 ордэнамі, медалямі.

Тв.: Облегченные стеновые конструкции в жилищном строительстве, Мн., 1962; Теплозащитные качества наружных стен крупнопанельных жилых и общественных зданий, М., 1965.

КАМЕ́НСКІ (Коменскі, Komenský) Ян Амос (28.3.1592, г. Ніўніца, Маравія — 15.11. 1670), чэшскі педагог-гуманіст, заснавальнік новай прагрэсіўнай педагагічнай сістэмы. Належаў да пратэстанцкай абшчыны «Чэшскія браты». Адукацыю атрымаў у Герборнскім і Гейдэльбергскім ун-тах. Прызнаваў аб'ектыўнасць свету і магчымасць яго пазнання з дапамогаю пачуццяў. Аднак у тлумачэнні некаторых з'яў і фактаў грамадскага жыцця знаходзіўся пад уплывам рэліг. ідэалогіі. З-за ганенняў каталіцкай царквы пакінуў радзіму і больш за 40 гадоў жыў у Польшчы, Швецыі, Венгрыі, Галандыі. Займаўся пед. і грамадскай дзейнасцю. Напісаў больш за 140 твораў. Найб. значныя: «Адчыненыя дзверы да моў» (1631), «Матчына школа» (1633), «Вялікая дыдактыка» (1657), «Свет, які бачым, у малюнках» (1658). Упершыню абгрунтаваў ідэю ўсеагульнага навучання дзяцей.



Патрабаваў навучання на роднай мове, выступаў у абарону жаночай адукацыі. Зыходзячы з таго, што ўсе дзеці роўныя паміж сабою, абараняў ідэю адзінай школы для дзяцей усіх саслоўяў. Прапанаваў наступную бессаслоўную сістэму адукацыі: матчына школа (да 6 гадоў, у сям'і); пачатковая школа роднай мовы (ад 6 да 12 гадоў); сярэдняя школа — гімназія; вышэйшая школа — акадэмія. Заснавальнік *дыдактыкі*, якую разумеў як тэорыю навучання, адукацыі і выхавання. Асн. дыдактычнымі прынцыпамі лічыў нагляднасць (называў «залатым правілам»), свядомасць, пасільнасць, паслядоўнасць навучання і трываласць ведаў. Гэтыя прынцыпы пакладзены ў аснову сучаснай прагрэс. тэорыі навучання. Абгрунтаваў перавагі *класна-ўрочнай сістэмы навучання:* упершыню ўвёў паняцці школьнага года, тыдня з пэўнай колькасцю навуч. гадзін, увёў у практыку ўрок і калект. работу вучняў пад кіраўніцтвам настаўніка, патрабаваў дакладнага планавання навуч. работы. Класна-ўрочная сістэма ў элементарным выглядзе практыкавалася ў брацкіх школах Чэхіі, Беларусі, Украіны (16—17 ст.). Асновай працэсу навучання К. лічыў дысцыпліну, мерамі выхавання — перакананне, павагу да асобы вучня. Вялікую ўвагу аддаваў ролі настаўніка, пасаду якога лічыў лепшай за іншыя пад сонцам. Працы К. зрабілі вял. ўплыў на развіццё школы і пед. думкі ва ўсім свеце.

Тв.: Рус. пер.— Избр. педагогические соч., т. 1—3, М., 1939—41; Избр. педагогические соч., М., 1955.

Літ.: Лордкипанидзе Д. О. Ян Амос Коменский. 1592—1670, 2 изд., М., 1970; Краснов-ский А. А. Ян Амос Коменский, М., 1953; Альт Р. Прогрессивный характер педагогики Коменского, пер. с нем., М., 1959; Мітюров Б. Н. Педагогічні ідеї Яна Амоса Коменського на Україні, Київ, 1971. *У. П. Мешчарэкоў.* Мінск.

КАМЕ́НСКІХ Мікалай Аляксандравіч [н. 8(21).10.1909, пас. Южнакамскі Аханскага пав. Пермскай губ.], перадавік станкабудавання, Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1944. У 1946—48 на Гомельскім станкабуд. з-дзе імя Кірава, у 1948—70 слесар-лякальшчык Мінскага станкабуд. з-да імя Кастр. рэвалюцыі. Жыве ў Мінску.

КАМЕНСК-УРА́ЛЬСКІ, горад абл. падпарадкавання ў Свярдлоўскай вобл. РСФСР, на р. Ісець (прыток Табола). Вядомы з канца 17 ст. У 1701 тут пачаў працаваць першы на Урале казённы чыгуналіцейны з-д. Чыг. вузел. 170 тыс. ж. (1971). Найб. значныя з-ды: алюмініевы, трубны, металаапр., электрамеханічны. Агульнатэхн. ф-т Уральскага політэхн. ін-та, алюмініевы тэхнікум, мед. вучылішча. Драм. тэатр, краязнаўчы музей.

Літ.: Каменск-Уральский — город на Исети, Свердловск, 1967.

КАМЕНТА́РЫЙ (ад лац. commentarius заметка, тлумачэнне), 1) тлумачэнне якой-н. думкі, з'явы, падзеі (напр., К. тэксту твора, дакумента, заўвага да тэксту кнігі, артыкула). 2) Артыкул, прамова, інтэрв'ю, якія даюць тлумачэнні або ацэнку эканамічных, паліт. і інш. падзей. У Ст. Рыме К. называліся гістар. творы (напр., каментарый Юлія Цэзара аб Гальскай вайне).

КА́МЕНШЧЫКАЎ Васіль Віктаравіч (13.1. 1879, г. Вятлуга Ніжагародскай губ.— 23.3. 1959), удзельнік барацьбы за ўладу Саветаў на Беларусі і Зах. фронце. З служачых. Чл. КПСС з чэрв. 1917. Скончыў Казанскае юнкерскае вуч. (1902). З 1899 у арміі. У 1-ю сусв. вайну на Зах. фронце, падпалкоўнік. У 1917 старшыня палкавога, дывізійнага і чл. армейскага к-таў, чл. Паўн.-Зах. абл. к-та РСДРП(б) і ВРК Зах. фронту і вобл., галоўнакамандуючы Зах. фронту [12(25).11—24.11 (7.12).1917]. З 1918 у органах ВЧК — камандзір корпуса і чл. калегіі ВЧК, нам. нач. войск унутр. аховы. З чэрв. 1920 на Зах. фронце — камандзір дывізіі, якая ўдзельнічала ў баях за вызваленне Беларусі ад польскіх акупантаў. У 1922—27 у Наркамаце шляхоў зносін СССР. Узнаг. ордэнам Чырв. Сцяга.



Тв.: За ўладу Саветаў (1917 год на Заходнім фронце). Успаміны. Мн., 1959.

КА́МЕНЬ, адзінка масы ў мернай сістэме Вял. кн. Літоўскага, 40 фунтаў (14,993 *кг*).

КА́МЕНЬ, група неалітычных паселішчаў *нёманскай культуры* (5—3-е тысячагоддзі да н. э.) на беразе р. Бобрык, на ПдУ ад в. Камень Пінскага р-на Брэсцкай вобл. Даследавалася У. Ф. Ісаенкам (1967—71). Пры раскопках знойдзены крамянёвыя сякеры і цёслы, наканечнікі стрэлаў, скрабкі, скоблі, праколкі, нажы, прылады працы з каменю і ўпершыню на Палессі з косці і рогу, косці дзікіх і свойскіх жывёл (быка, свінні, сабакі). Выяўленыя рэчы і ўмовы залягання культ. пласта памагаюць устанавіць найб. раннюю дату неаліту на тэр. Беларусі — 2-я пал. 5-га тысячагоддзя да н. э. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Каменны век.*

Літ.: Исаенко В. Ф. Неолитическое поселение Камень в верховьях Припяти, у кн.: Вопросы истории. Мн., 1969.

КА́МЕНЬ, вёска ў Зарачанскім с/с Валожынскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр саўгаса імя Маякоўскага. За 37 *км* на ПдУ ад Валожына, 65 *км* ад Мінска, 46 *км* ад чыг. ст. Койданава, на аўтамаб. дарозе г. п. Івянец — в. Налібокі. 879 ж., двароў 234 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, сталовая, 2 магазіны. У 1944 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

КА́МЕНЬ, вёска ў Камсамольскім с/с Капыльскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса імя Суворава. За 27 *км* на ПнУ ад Капыля, 98 *км* ад Мінска, 35 *км* ад чыг. ст. Слуцк, каля аўтамаб. дарогі Шышчыцы — Бабоўня (0,5 *км*). 507 ж., гасп. 156 (1971). Лесапільня, камбінат быт. абслугоўвання. Пач. школа, клуб, магазін. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

КА́МЕНЬ, вёска ў Гарадзецкім с/с Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр калгаса «Іскра». За 14 *км* на У ад Кобрына, 64 *км* ад Брэста, 8 *км* ад чыг. ст. Гарадзец, на аўтамаб. дарозе Кобрын — Пінск. 408 ж., гасп. 143 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі, магазін. Ням.-фаш. захопнікі часткова спалілі вёску. Помнік сав. воінам, партызанам і аднавяскоўцам, якія загінулі ў Айч. вайну.

КА́МЕНЬ (Камена), вёска ў Лепельскім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Калгасная праўда». За 20 *км* на ПнУ ад Лепеля, 95 *км* ад Віцебска, на аўтамаб. дарозе Лепель — Віцебск. 452 ж., двароў 150 (1971). Малаказавод, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, вет. пункт, аддз. сувязі, 3 магазіны. У 1944 ням.-фаш. захопнікі спалілі вёску, загубілі за час акупацыі 198 жыхароў (паводле ўдакладненых звестак). Помнік на брацкай магіле 76 сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны.

КАМЕНЯЛО́МНІК (Saxifraga), род адна- і шматгадовых травяністых раслін сям. каменяломнікавых. Вядома каля 300 відаў, пашыраных ва ўмераных і халодных паясах Паўн. паўшар'я; многія віды трапляюцца ў гарах, дзе іх карані праходзяць у трэшчыны скал (адсюль назва К.). У СССР каля 90 відаў, на Беларусі 3.



Каменяломнік балотны: *1* — агульны выгляд расліны; *2* — кветка.

Сцябло К.— кветкавая стрэлка. Лісце рознай формы, у прыкаранёвай разетцы. Кветкі белыя, жоўтыя ці чырвоныя, сабраныя ў мяцёлчатыя суквецці. Плод — каробачка. На Беларусі пашыраны від К. балотны (S. hirculus), расліна выш. 10—45 *см* з ярка-жоўтымі кветкамі і апушаным сцяблом. Расце на багністых лугах, балотах. К. вечназялёны, К. даўгалісты, К. махрысты вырошчваюцца як дэкаратыўныя.

КАМЕНЯРЭ́ЗНЫЯ МАШЫ́НЫ, машыны для вырэзвання будаўнічых блокаў з прыроднага каменю. Падзяляюцца на машыны для адкрытых і падземных распрацовак.

Паводле канструкцыі рэзальнага органа адрозніваюць К. м. з дыскавымі піламі, кальцавымі фрэзамі і барамі (рэзальныя ланцугі). К. м. з дыскавымі піламі выкарыстоўваюцца для вырэзвання камянёў з вапняку, ракушачніку; з кальцавымі фрэзамі — для рэзання амаль усіх горных парод, пашыраных у буд-ве; з барамі ўжываюцца для адкрытых і падземных распрацовак вапняку і вапняку-ракушачніку. Перавагі апошніх: вялікая глыбіня рэзу, лёгкасць і зручнасць перабудовы рэзальнага інструмента. Каменярэзныя агрэгаты, якія складаюцца з К. м., абсталяваных рознымі рэзальнымі інструментамі, і дапаможных прыстасаванняў для ўборкі з забою каменных блокаў, забяспечваюць высокі ўзровень механізацыі пры здабычы каменю.

Літ.: Белянчиков П. П. (сост.). Новые камнерезные и камнеобрабатывающие машины. Каталог-справочник, М., 1963; Сапожников М. Я. и Дроздов Н. Е. Справочник по оборудованию заводов строительных материалов, 3 изд., М., 1970.

І. М. Кедзіч. Мінск.

КА́МЕРА (грэч. kamára скляпенне, пакой), 1) закрытае памяшканне спец. прызначэння (К. хавання багажу, біятэрмічная К. і інш.). 2) У Зах. Еўропе ў сярэднія вякі — сховішча казны, а таксама ўстанова, якая наглядала за скарбам дзяржавы ці манарха. 3) Горная вырабка, прызначаная для размяшчэння абсталявання, а таксама для гасп. і санітарных мэт; ачышчальная вырабка невялікіх памераў пры камернай ці камерна-слупкаватай сістэме распрацоўкі карысных выкапняў. 4) Унутраная закрытая частка машыны, прылады (К. згарання, К. фатаграфічная і інш.). 5) К. іанізацыйная — прылада для вымярэння і даследавання выпрамяненняў (гл. *Іанізацыйная камера*). 6) Унутраная гумавая абалонка мяча, пнеўматычнага кола і інш.

КА́МЕРА Іван Паўлавіч [15(27).12.1897, в. Малыя Жухавічы Навагрудскага пав. Мінскай губ.— 21.1.1952], савецкі ваен. дзеяч, ген.-палк. артылерыі (1943). З сялян. Чл. КПСС з 1918. Скончыў Вышэйшую артыл. школу (1921). У Чырв. гвардыі з кастр. 1917, у Чырв. Арміі з ліп. 1918. У грамадз. вайну ўдзельнічаў у баях супраць войск Калчака і бурж. Польшчы — камісар дывізіёна, палка. Пазней нач. артылерыі дывізіі, корпуса, Забайкальскай і Паўн.-Каўказскай ваен. акруг. У Айч. вайну нач. артылерыі арміі, нам. камандуючага войск, нач. артылерыі Зах. фронту. Удзельнік абароны Масквы. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, 8 інш. ордэнамі, медалямі.



КА́МЕРНАЯ МУ́ЗЫКА (ад позналац. camera пакой), музыка для невялікага складу выканаўцаў (сола або розных ансамбляў — дуэта, трыо, квартэта і інш.). Ад сімф., харавой і опернай музыкі адрозніваецца больш інтымным зместам, дэталізацыяй усіх кампанентаў муз. драматургіі, індывідуалізацыяй асобных партый ансамбля, якая патрабуе ад кожнага выканаўцы больш поўнага выяўлення творчай актыўнасці.

Спачатку паняцце К. м. проціпастаўлялася паняццю царк. музыкі і звязвалася пераважна з хатнім музіцыраваннем; з 19 ст. К. м. выконваецца і ў канцэртных залах. Найважнейшыя жанры: раманс, інстр. мініяцюра, саната, ансамблі ў санатна-цыклічнай форме (трыо, квартэт, квінтэт і інш.). Вырашальную ролю ў выразным размежаванні камернай і сімф. музыкі і крышталізацыі камерна-інстр. жанраў адыграла венская класічная школа.

У перыяд станаўлення бел. прафес. кампазітарскай школы (творчасць М. Чуркіна і М. Аладава ў 20-я г.) аддавалася вял. ўвага К. м. Бел. кампазітары (Л. Абеліёвіч, Аладаў, А. Багатыроў, Я. Глебаў, Дз. Камінскі, С. Картэс, Дз. Лукас, І. Лучанок, П. Падкавыраў, Р. Пукст, Дз. Смольскі, Э. Тырманд і інш.) стварылі багатую камерную л-ру, у якой ахоплена большасць вак. і інстр. жанраў.

Літ.: Раабен Л. Н. Советская камерно-инструментальная музыка, Л., 1963; Рацкая Ц. С. Советская камерная музыка, М., 1965; Гісторыя беларускай савецкай музыкі, Мн., 1971.

В. І. Ялатаў. Мінск.

КАМЕРУН (Cameroun), Федэратыўная Рэспубліка Камерун, дзяржава ў Экватарыяльнай Афрыцы; абмываецца Гвінейскім залівам. Пл. 475,4 тыс. *км*². Нас. 5,8 млн. чал. (1970). Падзяляецца на 2 штаты (Заходні і Усх. К.). Сталіца Яўндэ. К.— федэратыўная рэспубліка, у якую ўваходзіць Усх. і Зах. Камерун. Дзейнічае канстытуцыя 1961. На чале дзяржавы і федэральнага ўрада — прэзідэнт, выбіраецца на 5 гадоў. Вышэйшы заканадаўчы орган — федэральны нац. сход, выбіраецца на 5 гадоў. Усх. і Зах. К. маюць свае заканадаўчыя сходы і ўрады.



Прырода. Большая ч. краіны занята нагор'ем. Сярэдняя выш. нагор'я 1000—1500 *м*. На ПнЗ — горы Адамава (найвыш. пункт 2710 *м* — г. Бамбутас). Уздоўж Атлантычнага ак. алювіяльная нізіна. На З узбярэжжа вулканічны масіў Камерун (4070 *м*). На ПнУ — алювіяльныя раўніны ўпадзіны воз. Чад. Карысныя выкапні: жал. руды, баксіты, тытанавая і алавяная руды, золата. Клімат на Пд экватарыяльны, вільготны, ападкаў 2000—3000 *мм* за год; на зах. схілах г. Камерун — самае дажджлівае месца ў Афрыцы (9655 *мм* за год); на Пн экватарыяльна-мусонны (дажджлівае лета і сухая зіма), ападкаў 1000—1500 *мм*; у раёне воз. Чад 300—500 *мм* за год. Сярэдняя месячная т-ра ад 23 да 28 °С. Многа рэк; значныя запасы гідраэнергіі. Найб. рака Санага. На Пд — вільготныя вечназялёныя экватарыяльныя лясы, якія на Пн пераходзяць у саванну. На тэр. К. нац. парк і 9 запаведнікаў агульнай пл. 19 780 *км*².

Насельніцтва. Большасць насельніцтва ўтварае тры этнічныя групы: паўн.-зах. банту — дуала, фанг, мака і інш. (на Пд), усх. бантоідная (у цэнтры) і хаўса (на Пн). Жывуць народы фульбе і народы Цэнтр. Судана. Дзярж. мовы: у Усх. К.— французская, у Зах.— англійская. Каля 48% веруючых трымаюцца традыцыйных вераванняў. 33% хрысціяне, 19% мусульмане. Сярэдняя шчыльн. 12,1 чал. на 1 *км*². Больш густа заселена паўд. частка. Сельскага нас. 90%. Найб. гарады

Яўндэ. Адзін з афрыканскіх кварталаў.





Дуала (260 тыс. ж., 1969) і Яўндэ (165 тыс. ж., 1969).

Гістарычная даведка. Першыя звесткі пра насельніцтва К. адносяцца да 5 ст. да н. э. На Пн К. выяўлены рэшткі матэрыяльнай культуры сярэдняга і верхняга палеаліту. Паўн. частка ў 8—15 ст. уваходзіла ў склад імперыі Сао, пазней султаната Мандара. У пач. 19 ст. качэўнікі-жывёлаводы фульбе заснавалі ў Паўн. і Цэнтр. К. некалькі феад. мусульманскіх княстваў-ламідатаў: Маруа, Гаруа, Тыбаты і інш. У 18—19 ст. значнага росквіту дасягнула цэнтралізаваная феад. дзяржава-султанат Бамум. У Паўд. К. дзярж. ўтварэнні склаліся толькі ў народа дуала. Большасць у 18—19 ст. знаходзілася на розных ступенях распаду першабытнаабшчыннага ладу. Першымі еўрапейцамі, якія высадзіліся ў 1472 у вусці р. Вуры, былі партугальскія маракі. У 16—17 ст. галандскія, потым англ., франц., ням. гандляры засн. на ўзбярэжжы гандл. факторыі. У 1884 Германія навязала правіцелям узбярэжных раёнаў К. дагавор аб 30-гадовым пратэктарате. У 1916 краіна акупавана англа-франц. войскамі і падзелена паміж Англіяй і Францыяй. У 1922 Ліга нацый перадала Усх. К. у мандатнае кіраванне Францыі, Зах. К. — Англіі. У снеж. 1946 абедзве тэр. К.— падапечныя тэр. ААН, аднак кіраванне асталося за Францыяй і Англіяй. Уздым нац.-вызв. руху ў К. вымусіў кіруючыя дзяржавы правесці канстытуцыйныя рэформы. У 1954 унутр. аўтаномію атрымаў Паўд. К. (частка Брыт. К.). У 1957 падапечная тэр. К. (франц. кіраванне) абвешчана падапечнай дзяржавай, якая 1.1.1960 абвешчана незалежнай, у сак. 1960 — Рэспублікай К. Першым прэзідэнтам і кіраўніком урада выбраны А. Ахіджа, лідэр партыі Камерунскі саюз (засн. 1958). Паводле плебісцыту (люты 1961) Паўн. К. (частка Зах. К. з англ. кіраваннем) далучаны да Федэрацыі Нігерыя. Насельніцтва паўд. часткі Зах. К. прагаласавала за аб'яднанне з Рэспублікай Камерун. 1.10.1961 утворана Федэратыўная Рэспубліка К. У краіне ўстанавілася адналартыйная сістэма. Кіруючая партыя — Камерунскі Нац. Саюз (КНС; засн. 1966). І з'езд КНС (1969) паставіў задачы: эканам. незалежнасць, умацаванне адзінства краіны і фарміраванне камерунскай нацыі. Эканам. палітыка прадугледжвае развіццё краіны капіталіст. шляхам пры спалучэнні прыватнага, замежнага, у апошнія гады і дзярж. капіталу з некат. элементамі рэгулявання і планавання. Гал. роля сярод іншаземных інвестытараў належыць франц. манаполіям, у апошнія гады актывізуюцца манаполіі ФРГ, ЗША, Японіі. Аснова знешнепаліт. курсу ўрада К.— палітыка недалучэння, супрацоўніцтва з афр. краінамі. Развіваюцца сувязі з Захадам, ад якога К. атрымлівае значную дапамогу. У 1964 у К. акрэдытавана дыпламат. прадстаўніцтва СССР. Падпісаны сав.-камерунскае гандл. пагадненне (1962), пагадненні аб эканам., тэхн. і культ. супрацоўніцтве (1963). З 20.9.1960 чл. ААН.

Гаспадарка. К.— эканамічна слаборазвітая аграрная краіна. У эканоміцы моцныя пазіцыі франц. і англ. капіталу. У с. гасп. занята 85% насельніцтва. Існуе абшчыннае землеўладанне. Лепшыя землі ў руках еўрапейцаў-плантатараў. На плантацыях вырошчваюцца экспартныя культуры (валавы збор, тыс. *т*, 1968): какава-боб 102,0, кава 55, тытунь 3,6, арахіс 125, а таксама бананы, каўчуканосы, бавоўнік, чай, перац. Сляпое вырошчваюць рыс, агародніну, маніёк, таро, у засушлівых раёнах проса, сорга, кукурузу. У 1967/68 было (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 1900, авечак 1500, свіней 350; гадуюць коз. Прамысловасць па перапрацоўцы драўніны (лесапіленне, вытв. фанеры, чыг. шпал, мэблі, драўнінных пліт, зборных дамоў), перапрацоўцы с.-г. прадукцыі. Вытв.

Камерун. Збор какавы-бобу.



пальмавага (40 тыс. *т*, 1968), арахісавага, бавоўнавага, какававага алею. У г. Эдэа працуе алюмініевы з-д (магутнасць 50 тыс. *т* у год) на энергіі ГЭС, пабудаванай на р. Санага, і на прыазным гліназёме. З-д належыць франц. капіталу. Невялікія тэкст., бавоўнаачышчальныя, рысаачышчальныя, тытунёвыя, чайныя прадпрыемствы, мясакансервавы з-д, з-ды па зборцы веласіпедаў, транзістарных радыёпрыёмнікаў, па вытв. цэменту, шкла, алюмініевапракатны з-д. Нязначная здабыча алавянай руды, золата, тытанавай руды. У 1968 выпрацавана 1,2 млрд. *квт·гадз* эл. энергіі. Даўж. чыгунак 827 *км*, аўтамаб. дарог 30,8 тыс. *км*, з іх з цвёрдым пакрыццём 1200 *км*. Марскія порты Дуала, Тыка, Вікторыя; аэрапорты Дуала, Яўндэ. Экспарт: кава, какава-боб, бананы, каўчук, драўніна, пальмавыя арэхі, алюміній, золата, цыгарэты; імпарт: машыны і трансп. сродкі, хім. і харч. тавары, тэкст. вырабы і паўфабрыкаты, металы і металавырабы. Асноўныя гандл. партнёры: Францыя, ЗША, ФРГ, Вялікабрытанія. Грашовая адзінка — афрыканскі франк.

Асвета. Першыя місіянерскія школы ўзніклі ў канцы 19 ст. У школах выкладалі пераважна на англ. ці франц. мовах. У 1953/54 навуч. г. ў брыт. К. на паўд. узбярэжжы навучалася 27%, на Пн толькі 2% дзяцей. Пасля завалявання незалежнасці ўрад робіць захады для ліквідацыі непісьменнасці, выдаюцца падручнікі для школ. Школы дзярж. і прыватныя. Фактычна існуе 2 школьныя сістэмы: у Зах. К. тэрмін навучання ў пач. школе 8 гадоў, у сярэдняй 5; у Усх. К. ў пач. школе 6 гадоў, у сярэдняй 7. У 1967 у пач. школах навучалася 750 тыс. дзяцей, у сярэдніх 30,6 тыс. У 1962 засн. першая ВНУ ў краіне — Федэральны ун-т; існуюць вышэйшая пед. і с.-г. школы. Найб. буйныя б-кі — Цэнтр. і б-ка Ін-та навук. даследаванняў. Навук. ўстановы: Ін-т навук. даследаванняў Камеруна, НДІ маслічных раслін, Ін-т Пастэра.

Архітэктура, выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Сярод разнастайных тыпаў нар. жылля ў К. найбольш цікавыя конусападобныя хаціны, вылепленыя з гліны (выш. 6—8 *м*). Уваход і сцены ўнутры хаціны ўпрыгожаны прадрапаным арнаментам або паліхромным геам. узорам. У народаў К. пашырана разьба па дрэве. Шматлікія прадметы побыту (драўляны посуд, лавы, крэслы і інш.) часта робяцца ў выглядзе складанай разьбянай кампазіцыі. З дрэва вырэзваюць культавыя слупападобныя статуэткі, афарбоўваюць у яркія колеры і аздабляюць ракавінамі, бранзалетамі, каралямі, кавалачкамі шкла. Маскі (найчасцей жахлівыя) вырэзваюць з дрэва і абцягваюць скурай. Традыц. маст. рамёствы: ганчарства (посуд, люлькі, попельніцы), ліццё з бронзы (абаны, вазы, люлькі), вышыўка, выраб калебасаў (посуд з гарбузоў), рытуальных прадметаў з бісеру. Пачынае развівацца прафес. мастацтва. З канца 19 ст. сталі ўзнікаць гарады. У архітэктуры пануе эклектыка. Цэнтр. раёны гарадоў забудоўваюцца дамамі сучаснага еўрап. стылю, ускраіны — дамамі-баракамі.

Літ.: История Африки в XIX — начале XX в., М., 1967; Новейшая история Африки, 2 изд., М., 1968; Орлова А. С. Уровень общественного развития народов Камеруна к началу европейской колонизации Африки. «Советская этнография», 1959, № 5; Голубчик М. М. Федеративная Республика Камерун, М., 1968; Логинова В. П. Федеративная Республика Камерун, М., 1968; Ольдерогге Д. Искусство народов Западной Африки в музеях СССР, Л.— М., 1958.

М. С. Вайтовіч (прырода, насельніцтва, гаспадарка). Мінск; *В. П. Логінава* (гістар. даведка). Масква.

КАМЕ́РЦЫЯ (лац. commercium), гандаль. У капіталіст. грамадстве абазначае дзейнасць дзеля прыбытку. Камерсант — той, хто гандлюе, купец.

КАМЕ́ТЫ (ад грэч. komḗtēs літар. доўгавалосы), нябесныя свяцілы, якія маюць выгляд хвастатай зоркі ці туманнай плямы і перамяшчаюцца адносна зорнага фону (гл. рыс.). Назіраюцца, калі невялікае ледзяное цела, т. зв. ядро К., наблізіўшыся да Сонца, прагрэўшыся яго прамянямі, пачынае выдзяляць газы і пыл, якія ўтвараюць вакол ядра туманную абалонку (атмасферу К.). Абалонка разам з ядром складае галаву К. Ад дзелянля светлавога ціску (гл. *Ціск святла*) і сонечнага ветру газы і пыл адносяцца ад ядра, утвараючы хвасты, накіраваныя ад Сонца. Хвасты менш яркія, чым галава, і таму назіраюцца не ва ўсіх К. Тэорыю ўтварэння каметных хвастоў распрацаваў у 19 ст. рус. астраном Ф. А. *Бредзіхін.*



Камета Галея ў 1910.

Папярочнікі ядраў К. звычайна бываюць ад 1 да 50 *км*, а маса 10^{11}—10^{17} *кг*. Бачныя памеры галавы К.— ад некалькіх тысяч да 1—2 млн. *км*, прычым памеры мяняюцца пры змене адлегласці К. ад Сонца. Хвост у некат. К. удавалася прасачыць да адлегласці 200 млн. *км* ад ядра і большай. У галаве і ў хвастах рэчыва вельмі разрэджанае. Ядры К. складаюцца з вадзянога лёду з прымессю замёрзлых газаў і камяністых рэчываў. Ядро свеціцца адбітым сонечным святлом; галава і хвост паглынаюць і перавыпрамяняюць сонечную энергію. Аналіз спектраў К. паказвае, што ў галовах і хвастах звычайна ёсць нейтральныя малекулы вугляроду C_2, цыяну CN, вуглевадароду CH, гідрыду азоту NH, гідраксілу OH і інш., іанізаваныя малекулы вокісу вугляроду CO^+, азоту N_2^+, а таксама атамы H, O і Na.



Конусападобная гліняная хаціна народа мусгу. 20 ст.

К.— аб'екты Сонечнай сістэмы. Яны рухаюцца вакол Сонца па выцягнутых эліптычных арбітах розных памераў (гл., напр., *Галея камета*). Вядома больш за 100 кароткаперыядычных К.; кожныя некалькі гадоў яны набліжаюцца да Сонца, растрачваюць запас ільдоў і таму разбураюцца хутчэй за іншыя. У большасці К. памеры арбіт у тысячы разоў боль-

шыя за папярочнік планетнай сістэмы, такія К. набліжаюцца да Сонца праз мільёны гадоў.

Літ.: Орлов С. В. О природе комет, М., 1960; Добровольский О. В. Кометы, М., 1966.

Б. Ю. Левін. Масква.

КАМЗАРАКАЎ Дзмітрый Канстанцінавіч (10.4.1918, с. Каланок Бійскага пав. Томскай губ.— 23.8.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). На фронце з вер. 1941. Вызначыўся пры прарыве абароны праціўніка на р. Проня. На чале ўзвода пераадолеў драцяныя загароды і міннае поле праціўніка, у рукапашнай схватцы выбіў ворага з траншэй і авалодаў важнай вышынёй.

КАМІЗЭЛЬКА, від безрукаўкі, частка пар. мужч. гарнітура ў канцы 19 — пач. 20 ст.

Шылі звычайна з даматканага сукна ці палатна, часам з тканых фабрычных тканін аднатонных колераў. На Палессі насілі К. з узорыстых тканін.



На Магілёўшчыне і Пд Міншчыны бытавалі камбінаваныя К., у якіх перад шыўся з лепшага матэрыялу (сукна, шэрсці, корту), а спінка з палатна. У беларусаў найболей пашыраны К. прамога крою без каўняра. К. часам уваходзіць у сучасны мужчынскі гарнітур.

Г. І. Дулеба. Мінск.

КАМІНСКАЯ Ірына Пятроўна (22.1.1933, в. Порплішча Докшыцкага р-на — 4.11.1963), перадавік сельскагаспадарчай вытворчасці, Герой Сац. Працы (1958). У 1948—57 свінарка, у 1957—59 даярка саўгаса «Сітца», у 1961—63 свінарка саўгаса «Порплішча» Докшыцкага р-на Віцебскай вобл.

КАМІНСКІ Аляксандр Аляксандравіч (14.11.1919, в. Вавукі Ашмянскага пав. Віленскай губ.— 3.6.1944), удзельнік партыз. руху ў Айч. вайну на Беларусі. З сялян. Чл. ВЛКСМ. З 1940 у Ашмянскім райаддзеле міліцыі Вілейскай вобл. У час ням.-фаш. акупацыі (у лют. 1943) з развед. мэтамі ўладкаваўся на працу ў Мінскую паліцыю. Здабываў для партызанаў развед. звесткі і зброю. Пасля арышту ў маі 1943 уцёк, дзейнічаў у партыз. спец. групе «Мсціўцы». У снеж. 1943 з Я. І. Куцэвічам знішчыў бургамістра Мінска Іваноўскага. Загінуў пры выкананні баявога задання каля в. Сёмкаў Гарадок Мінскай вобл. Узнаг. ордэнам Айч. Вайны 1-й ступені. Яго імем названы вул. ў г. Смаргонь і Крэўская СШ у Смаргонскім р-не Гродзенскай вобл.

Літ.: Новікаў І. Дарогі скрыжаваліся ў Мінску, Мн., 1964.

КАМІНСКІ Дзмітрый Раманавіч [н. 4(17).8.1907, Екацярынаслаў], беларускі савецкі кампазітар. Засл. дз. маст. БССР (1963). Скончыў Растоўскі муз. тэхнікум (1930), у 1936—41 вучыўся ў Маск. ін-це павышэння кваліфікацыі музыкантаў-педагогаў. Працаваў у Растове, Архангельску, Варонежы. У Айч. вайну ў Сав. Арміі. З 1945 у Мінску, у 1957—63 у Дзярж. выдавецтве БССР, у 1963—66 старшыня праўлення Саюза кампазітараў БССР. У творчасці выявіў схільнасць да інстр. музыкі, асабліва да жанру канцэрта. Першы сімф.-рыў канцэрты для цымбалаў. Вытокі муз. мовы К. ў масавых жанрах і бел. фальклоры.

Тв.: Кантата Зямля расцвітае (1952); сімф.— 3 сюіты, 2 паэмы, канцэрты для фп. (1949, 1953), скрыпкі (1948, 1963), віяланчэлі (1957), дуэта цымбалаў (1948) з арк., фантазія на тэму бел. нар. песні «Юрачка» для фп. з арк. (1959); для аркестра бел. нар. інструментаў — 2 сюіты на бел. тэмы, 2 увертюры, канцэрт для цымбалаў (1947); камерна-інстр.— фп. трыо (1966), смыковы квартэт (1968), санаты для фп. (1961), для скрыпкі і фп. (1950), п'есы для фп., скрыпкі, віяланчэлі; музыка да фільмаў, у т. л. «Хто смяецца апошнім» (1954), тэатр. пастановак.

Літ.: Ауэрбах Л. Дзмітрый Камінскі. Мн., 1970; Бергер Л., Д. Р. Каминский, М., 1971.

Т. А. Дубкова. Мінск.

КАМІНСКІ Іван Іларыёнавіч (н. 8.11.1919, в. Мяккія Сенненскага пав. Віцебскай губ.), Герой Сав. Саюза (1945). З сялян. Чл. КПСС з 1946. Скончыў школу лётчыкаў (1941), Рэсп. парт. школу пры ЦК КП(б)Б (1948), Вышэйшую парт. школу пры ЦК КПСС (1963). У Айч. вайну на Зах. і 3-м Бел. франтах — нам. камандзіра авіяэскадрыллі разведвальнага авіяпалка. Удзельнік абароны Масквы, вызвалення Арлоўскай, Смаленскай абл., Віцебска, Оршы, Магілёва, Мінска, Маладзечна, Літвы, Польшчы, баёў ва Усх. Прусіі. Зрабіў 239 баявых вылетаў, сфатаграфаваў 26 585 км² варожай абароны. З 1948 на парт. і сав. рабоце ў Мінску.



КАМІНСКІ Сямён Давыдавіч (1861, мяст. Барэна Чарнігаўскай губ.— 15.5.1939), беларускі савецкі вучоны ў галіне афтальмалогіі. Праф. (1923). Чл. КПСС з 1921. Скончыў мед. ф-т Кіеўскага ун-та (1889). Працаваў у Мінску ўрачом-афтальмолагам (1890—1922), заг. кафедры вочных хвароб БДУ і Мінскага мед. ін-та (1923—39). Удзельнік рэвалюц. руху на Беларусі. Народны камісар аховы здароўя БССР (1920). Асн. працы па вывучэнні трахомы і вочнага траўматызму.

Тв.: Трахома, 3 выд., Мн., 1935.

КАМІНТЭРН, гл. *Камуністычны Інтэрнацыянал.*

«КАМІНТЭРН», калгас малочна-мяснога кірунку ў Аршанскім раёне Віцебскай вобл. Створаны ў 1950 на базе 4 дробных калгасаў. Аб'ядноўвае 5 населеных пунктаў: *Ларынаўку* (цэнтр), Стахоўку, Пашына, Шатравіна, Шугайлава (усяго 322 двары).

На пач. 1971 у калгасе 2558 *га* зямлі, з іх 1673 *га* ворнай. У 1970 ад кожнай каровы надоена 3085 *кг* малака. На 100 *га* с.-г. угоддзяў яго атрымана 708 *ц* і 111,8 *ц* мяса (у жывой вазе). Ураджай (*ц/га*): збожжавых 30,3, бульбы 220. Валавы даход калгаса 910,6 тыс. руб., чысты даход 430,2 тыс. руб., непадзельны фонд 1,5 млн. руб., фонд спажывання 618,3 тыс. руб., аплата чалавека-дня 4 руб. 41 кап. У калгасе 26 трактароў, 17 аўтамашын, 10 збожжа-, 6 бульба-, 3 сіласаўборачныя камбайны. Паводле ген. плана перабудовы вёсак калгаса цэнтр яго пераўтвараецца ў гар. пасёлак. У 1966 калгас узнаг. ордэнам Леніна.

Літ.: Титович И. И. Полится чаша изобилия, Мн., 1968.

І. І. Цітовіч. Аршанскі раён.

«КАМІНТЭРН», калгас мяса-малочнага кірунку ў Магілёўскім раёне. Створаны ў 1929 на базе таварыства па сумеснай апрацоўцы зямлі «Жыццё». Аб'ядноўвае 13 населеных пунктаў: 1, 2, 3-ю Мікалаеўку, 1-я і 2-я Палыкавічы, Камінтэрн, Палавінны Лог, Купёлы, в. Калінавую, Бярозаўку, Сенькава, Грузаўку, Саломенку (усяго 1091 двор). Цэнтр калгаса — *Мікалаеўка 2-я.*

На пач. 1971 у калгасе 6386 *га* зямлі, з іх 3639 *га* ворнай, 653 *га* сенажацяў, 421 *га* пашы. У 1970 ад кожнай каровы надоена 2830 *кг* малака, на 100 *га* с.-г. угоддзяў яго атрымана 803,5 *ц* і 177,2 *ц* мяса (у жывой вазе). Ураджай (*ц/га*): збожжавых 27,6, бульбы 135, каранеплодаў 276. Валавы даход калгаса 2,9 млн. руб., чысты даход 1,6 млн. руб., непадзельны фонд 5 млн. руб., фонд спажывання 1 млн. 386 тыс. руб., аплата чалавека-дня 4 руб. 25 кап. У калгасе 73 трактары, 49 аўтамашын, 20 збожжа-, 16 бульба-, 5 сіласаўборачных камбайнаў, 18 лёнамалатарняў. Паводле ген. плана перабудовы вёсак калгаса цэнтр яго пераўтвараецца ў гар. пасёлак. Перадавікам вытворчасці Т. С. *Зубаравай,* П. Б. *Пракопневай,* Р. А. *Пускіну,* С. І. *Слабадзяну,* І. В. *Сяргееву* прысвоена званне Героя Сац. Працы. У 1968 калгас узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга.

А. І. Якірэвіч. Магілёўскі раён.

КАМІСАР (лац. commissarius упаўнаважаны), службовая асоба, надзеленая ўрадам асобымі паўнамоцтвамі. У перыяд франц. бурж. рэвалюцыі канца 18 ст.— упаўнаважаныя Канвента ў дэпартаментах або ў войсках. У СССР: 1) у 1917 — 46 (да ўтварэння міністэрстваў) — член урада, які ўзначальваў цэнтр. орган галіновага кіравання *(народныя камісарыяты);* 2) асобы, якія ўзначальваюць *ваенныя камісарыяты.* Гл. таксама *Ваенныя камісары;* 3) спец. званне, якое прысвойваецца асобам вышэйшага начальніцкага складу органаў міліцыі.

КАМІСАРАВА Марыя Іванаўна [н. 22.7(4.8).1904, с. Андрэеўскае Кастрамскога пав.], руская савецкая паэтэса, перакладчыца. Першы зб. вершаў «Зазімак» (1928). Аўтар зб. «Пераправа» (1932), «Сустрэча» (1936). Перакладала творы Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, Цёткі, П. Броўкі, К. Буйло, П. Глебкі, А. Звонака, А. Куляшова, П. Панчанкі, М. Танка і інш.

Тв.: Моя тропинка продолжается, Л., 1961; Самое дорогое, М.— Л., 1962; Стихотворения.— Лиза Чайкина. Поэма, М.— Л., 1964; Стихи о Ленинграде, Л., 1967; Дорога к друзьям, Л., 1968; бел. пер. у кн.— Паэты Ленінграда, Мн., 1948; Рускай савецкай паэзіі, Мн., 1953; у час. «Беларусь», 1969, № 10.

КАМІСАРЖЭЎСКАЯ Вера Фёдараўна [27.10(8.11).1864, Пецярбург — 10(23).2.1910], руская актрыса і тэатральная дзеячка. Дачка спявака Ф. П. Камісаржэўскага.



З 1891 на аматарскай, з 1894 на прафес. правінцыяльнай сцэне. З 1896 у Александрынскім т-ры. У 1904 арганізавала Драм. т-р К. (Пецярбург). Ролі: Розі («Бой матылькоў» Г. Зудэрмана), Ларыса, Негіна («Беспасажніца», «Таленты і паклоннікі» А. Астроўскага), Вара («Дзікунка» Астроўскага і М. Салаўёва), Ніна Зарэчная («Чайка» А. Чэхава), Варвара Міхайлаўна («Дачнікі» М. Горкага), Нора («Нора» Г. Ібсена) і інш. Драматызм, эмацыянальнасць, лірызм уласцівы мастацтву К. Паказвала трагічны лёс рус. жанчыны, якая не знаходзіла свайго месца ў жыцці; перадавала думкі і настроі сучаснай ёй дэмакр. інтэлігенцыі. К. была блізкая да рэвалюц. колаў. Грамадзянская накіраванасць вызначала мастацтва К. і яе т-ра ў 1904—05. Грамадска-паліт. з'явамі сталі пастаноўкі п'ес М. Горкага ў т-ры К. Пасля 1905 шмат гастралявала, у т. л. на Беларусі (1902 — Мінск, Віцебск; 1906 — Мінск, Віцебск, Магілёў; 1907 — Мінск).

Літ.: Вера Федоровна Комиссаржевская. Письма актрисы. Воспоминания о ней. Материалы, Л.— М., 1964; О Комиссаржевской, М., 1965.

КАМІСАРЫ ГУБЕРНСКІЯ І ПАВЯТОВЫЯ, службовыя асобы Часовага ўрада, якія стаялі на чале губ. і павят. камісарыятаў у Расіі пасля Лютаўскай бурж.-дэмакр. рэвалюцыі. У сваёй дзейнасці апіраліся на губ. і павят. земскія ўстановы, а таксама на інш. бурж. арг-цыі і з'яўляліся выканаўчай уладай *Часовага ўрада* на месцах.

КАМІСАРЫЯТ ПА БЕЛАРУСКІХ СПРАВАХ, аддзел Наркамнаца РСФСР. Гл. *Беларускі Нацыянальны Камісарыят.*

КАМІСІІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР, дапаможныя пастаянныя або часовыя органы, якія ствараюцца з ліку дэпутатаў Вярх. Савета БССР для вывучэння і папярэдняй падрыхтоўкі пытанняў, што разглядаюцца Вярх. Саветам, і для кантролю за выкананнем прынятых ім законаў і пастаноў. Паўнамоцтвы пастаянных камісій вызначаюцца Канстытуцыяй БССР (арт. 32) і Палажэннем аб пастаянных камісіях Вярх. Савета БССР ад 28.7.1960. Часовыя камісіі (следчыя, рэвізійныя) ствараюцца для выканання асобных даручэнняў. Іх паўнамоцтвы вызначаюцца Канстытуцыяй БССР (арт. 33).

Пастаянныя камісіі ўтвараюцца на ўвесь тэрмін паўнамоцтваў Вярх. Савета БССР у складзе старшыні, яго нам. і членаў, з ліку якіх выбіраецца сакратар. Колькасць пастаянных камісій Вярх. Савета БССР пасля XX з'езду КПСС (1956) павялічылася, іх паўнамоцтвы пашырыліся. На 1-й сесіі Вярх. Савета БССР 8-га скл. створаны пастаянныя камісіі: мандатная, заканадаўчых меркаванняў, планава-бюджэтная, па замежных справах, справах моладзі, прамысловасці, транспарце і сувязі, буд-ве, с. гасп., камунальнай гасп., добраўпарадкаванні і дарожнім буд-ве, нар. асвеце, ахове здароўя і сац. забеспячэнні, культурна-асветнай рабоце, гандлі і грамадскім харчаванні, бытавым абслугоўванні насельніцтва, ахове прыроды і інш. Камісіі падрыхтоўваюць пытанні і законапраекты, якія разглядаюцца на сесіях Вярх. Савета. Ажыццяўляюць кантроль за ўсімі органамі і арг-цыямі рэспублікі, правяраюць дзейнасць органаў дзярж. кіравання, якія падсправаздачныя Вярх. Савету БССР. Пасяджэнні камісій склікаюцца па неабходнасці, але не радзей аднаго разу ў тры месяцы. Пасяджэнні правамоцныя, калі на іх прысутнічае не менш ⅔ складу камісіі; рашэнні прымаюцца простай большасцю галасоў. У рабоце камісій могуць удзельнічаць з правам дарадчага голасу дэп. Вярх. Савета, якія не з'яўляюцца членамі камісій, а таксама спецыялісты і актыў. Рашэнні пастаянных камісій рэкамендацыйныя і павінны абавязкова разглядацца тымі органамі, якім накіраваныя, не пазней як у двухтыдневы тэрмін.

Кр.: Сборник законов Белорусской ССР и указов Президиума Верховного Совета Белорусской ССР. 1938—1967 гг., т. 1, Мн., 1968, с. 82—92.

Літ.: Гл. пры арт. *Камісіі Вярхоўнага Савета СССР.* *А. А. Галайко.* Мінск.

КАМІСІІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР, дапаможныя пастаянныя або часовыя органы, якія ствараюцца з ліку дэпутатаў Вярх. Савета СССР для папярэдняй падрыхтоўкі пытанняў, што належаць да кампетэнцыі Савета. Паўнамоцтвы пастаянных камісій вызначаюцца Канстытуцыяй СССР (арт. 50) і Палажэннем аб пастаянных камісіях Савета Саюза і Савета Нацыянальнасцей Вярх. Савета СССР ад 12.10.1967. Часовыя камісіі (следчыя, рэвізійныя, рэдакцыйныя) ствараюцца, каб выканаць канкрэтнае заданне.

Кожная палата ўтварае аднайменныя пастаянныя камісіі на ўвесь тэрмін паўнамоцтваў Вярх. Савета СССР у складзе старшыні і членаў, з ліку якіх выбіраюцца нам. старшыні і сакратар. На 1-й сесіі Вярх. Савета СССР 8-га скл. створаны пастаянныя камісіі: мандатная, заканадаўчых меркаванняў, планава-бюджэтная, па замежных справах, справах моладзі, прамысловасці, транспарце і сувязі, буд-ве і прамысловасці буд. матэрыялаў, с. гасп., ахове здароўя і сац. забеспячэнні, нар. асвеце, навуцы і культуры, гандлі, бытавым абслугоўванні і камунальнай гасп., ахове прыроды. Пастаянныя камісіі падсправаздачныя і адказныя перад палатай, што іх выбрала. У перыяд паміж сесіямі іх дзейнасць каардынуе Прэзідыум Вярх. Савета СССР. Асн. задачы камісій: распрацоўваць прапановы для разгляду іх палатамі або Прэзідыумам Вярх. Савета; падрыхтоўваць заключэнні па пытаннях, якія павінны разглядаць Вярх. Савет і яго Прэзідыум; садзейнічаць дзярж. органам, арг-цыям і дэпутатам у ажыццяўленні рашэнняў Вярх. Савета СССР і яго Прэзідыума; кантраляваць дзейнасць міністэрстваў, ведамстваў і інш. грамадскіх, рэсп. і мясц. органаў па правядзенні ў жыццё нарматыўных актаў. Камісіі маюць права звяртацца з пытаннямі і прапановамі да ўрада СССР і асобных яго членаў. Выносяць рэкамендацыйныя рашэнні, якія павінны абавязкова разглядацца адпаведнымі органамі не болей як у двухмесячны тэрмін. Рашэнні прымаюцца простай большасцю галасоў камісіі. Пастаянныя камісіі працуюць на аснове шырокай ініцыятывы іх членаў, калегіяльнасці і публічнасці. Да сваёй работы могуць прыцягваць спецыялістаў.

Літ.: Шафир М. А. и Чернов Б. В. Верховный Совет СССР, М., 1966; Махненко А. Х. Постоянные комиссии Верховного Совета СССР и Верховных Советов союзных республик, М., 1969.
А. А. Галайко. Мінск.

КАМІСІІ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ, спецыяльныя органы мясцовых Саветаў, якія ствараюцца з ліку дэпутатаў адпаведнага Савета. Выбіраюцца на сесіі Савета на тэрмін яго паўнамоцтва ў складзе старшыні; яго намесніка, сакратара і членаў камісіі. Кіруе камісіямі Савет, які іх стварыў.

Дзейнічаюць на аснове калегіяльнасці і публічнасці. Найб. важнае значэнне маюць пастаянныя камісіі, якія ўтвараюцца па асн. галінах дзейнасці адпаведных Саветаў для штодзённага ўдзелу ў ёй дэпутатаў і шырокага актыву працоўных. Зыходзячы з мясцовых умоў, Саветы могуць ствараць камісіі: мандатную, планава-бюджэтную, прамысловую, сельскагаспадарчую, камунальнай гасп., нар. асветы і культуры, аховы здароўя і сац. забеспячэння, гандлю і грамадскага харчавання, бытавога абслугоўвання, сацыяліст. законнасці і аховы грамадскага парадку, па справах моладзі, аховы прыроды, фіз. культуры і спорту і інш. Камісіі садзейнічаюць ажыццяўленню рашэнняў Саветаў і вышэйшых дзярж. органаў, выносяць абавязковыя рашэнні па шэрагу пытанняў, удзельнічаюць у распрацоўцы праектаў планаў развіцця нар. гасп. і бюджэтаў па сваіх галінах, кантралююць дзейнасць аддзелаў і ўпраўленняў выканкома і падначаленых Саветам прадпрыемстваў, арг-цый і устаноў і інш.

Пастаянныя камісіі Вярхоўнага і мясцовых Саветаў БССР у сваёй дзейнасці кіруюцца Канстытуцыяй СССР і Канстытуцыяй БССР, Палажэннем пра адпаведныя Саветы дэпутатаў працоўных, Палажэннем пра пастаянныя камісіі абласных, раённых, гарадскіх, сельскіх і пасялковых Саветаў дэпутатаў працоўных Беларускай ССР, рашэннямі адпаведных Саветаў. У пастаянных камісіях мясцовых Саветаў рэспублікі працуюць больш як 68 тыс. дэпутатаў і 80 тыс. актывістаў.

Кр.: Сборник законов Белорусской ССР и указов Президиума Верховного Совета Белорусской ССР. 1938—1967 гг., т. 1, Мн., 1968, с. 179—196; Закон Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі аб раённым Савеце дэпутатаў працоўных Беларускай ССР, Мн., 1971, разда. 3, арт. 66—78; Закон Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі аб гарадскім, раённым у горадзе Савеце дэпутатаў працоўных Беларускай ССР, Мн., 1971, раздз. 4, арт. 70—82. *А. А. Крайчанка.* Мінск.

КАМІСІЙНЫ ГАНДАЛЬ (ад лац. commissio даручэнне), гандаль праз пасрэдніка (камісіянера), якому даручыцель (камітэнт) выплачвае пэўную (камісійную) узнагароду.

У СССР гандл.-пасрэдніцкія канторы Міністэрства гандлю выконваюць даручэнні гасп. арг-цый і прадпрыемстваў па закупе ці продажы некат. тавараў. Розначны К. г. праводзіцца дзярж. і каап. камісійнымі магазінамі. Рэчы ад насельніцтва прымаюцца і прадаюцца па цэнах, якія не перавышаюць дзярж. розначных цэн. Існуе таксама К. г. с.-г. прадуктамі праз магазіны спажывецкай кааперацыі, дзе цэны вызначаюцца па дамоўленасці. У капіталіст. краінах К. г. знаходзіцца ў руках буйных манаполій, пашыраны ў знешніх сувязях.

КАМІСІЯ (лац. commissio даручэнне), 1) калегіяльны орган, які ўтвараецца пастаянна або часова для выканання пэўных задач. 2) У грамадзянскім праве — дагавор, паводле якога адзін бок (камісіянер) абавязваецца за ўзнагароду зрабіць пэўныя здзелкі ад свайго імя па даручэнні, у інтарэсах і за кошт другога боку (камітэнта).

«КАМІСІЯ ПА РАССЛЕДАВАННІ АНТЫАМЕРЫКАНСКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ», пастаянная камісія кангрэсу ЗША, адзін з самых рэакц. органаў, з дапамогай якога ўрад ЗША распраўляецца з прагрэс. дзеячамі і арг-цыямі. Першапачаткова засн. ў 1934, у 1938 атрымала статус часовай, з 1946 — пастаянная. Мае разгалінаваны апарат з філіяламі ў найбуйнейшых гарадах краіны. Афіц. мэта дзейнасці — збор інфармацыі аб распаўсюджванні ў ЗША падрыўной і антыамерыканскай прапаганды замежнымі дзяржавамі ці ўнутранымі коламі. Фактычна стварае ў краіне надзвычай напружаную атмасферу падазронасці, страху і паліт. нецярпімасці.

КАМІТАС [сапр. Сагаманян Сагамон Геворкавіч; 26.9.(8.10). 1869, мяст. Куціна, Турцыя — 22.10.1935], армянскі кампазітар, фалькларыст, харавы дырыжор, спявак, музычны дзеяч. Заснавальнік арм. класічнай музыкі, нац. школы спеваў і навук. муз. этнаграфіі. Музыцы вучыўся ў Эчміядзінскай духоўнай акадэміі, у М. Екмаляна (Тыфліс, 1895), у прыватнай кансерваторыі Р. Шміта



(Берлін, 1896—99). Узначальваў муз. класы і арганізаваны ім хор Эчміядзінскай акадэміі, збіраў і даследаваў муз. фальклор (запісаў больш за 3000 арм., курдскіх, персідскіх, тур. нар. песень), прапагандаваў арм. музыку ў Закаўказзі і Зах. Еўропе. З прычыны канфлікту з царк. ўладамі ў 1910 пераехаў у Канстанцінопаль. Апошнія 20 гадоў жыцця пакутаваў ад цяжкай душэўнай хваробы. Гал. ў творчай спадчыне К.— апрацоўкі арм. песень, асабліва харавыя. Выяўляючы багацце інтанацыйнай, ладавай і метрарытмічнай будовы страж. аднагалосых напеваў, К. ствараў на іх аснове высокамаст. ўзоры шматгалосся.

Літ.: Шавердян А. Комитас и армянская музыкальная культура, Ереван, 1956.

КАМІТЭТ (лац. committo даручаю), калегіяльны орган, які кіруе пэўнай галіной дзяржаўнай або грамадскай дзейнасці.

КАМІТЭТ 18 ДЗЯРЖАЎ ПА РАЗЗБРАЕННІ, створаны ў 1961 паводле рашэння XXIV сесіі ААН для разгляду найважнейшых пытанняў праблемы раззбраення. З 1969 *Нарада Камітэта па раззбраенні.*

КАМІТЭТ АБАРОНЫ МІНСКА (Камітэт рабочай абароны), аператыўны орган Мінскага Савета, створаны для садзеяння Чырв. Арміі ў абароне горада ад польскіх акупантаў. Заснаваны 8.5.1919 на сумесным пасяджэнні Мінскага Савета, Савета прафсаюзаў і прадстаўнікоў фаб.-зав. к-таў горада. Складаўся з 9 чл.: А. С. Славінскага, Ш. Ш. Ходаша, М. І. Крывашэіна, В. І. Яркіна і інш. Тры месяцы вёў работу па забеспячэнні фронту амуніцыяй і харчамі, праводзіў мабілізацыі працоўных у Чырв. Армію і на абарончыя работы.
П. А. Селіванаў. Мінск.

КАМІТЭТ БАРАЦЬБЫ З НЯМЕЦКІМІ АКУПАНТАМІ, міжраённы антыфашысцкі к-т у Брэсцкай вобл. ў маі 1942 — ліп. 1943. Гл. *Брэсцкі абласны антыфашысцкі камітэт.*

«КАМІТЭТ ВЫРАТАВАННЯ РАДЗІМЫ І РЭВАЛЮЦЫІ», контррэвалюцыйная арг-цыя, створаная 26.10(8.11).1917 у Петраградзе з прадстаўнікоў гар. думы, Цэнтрафлота, партый эсэраў, меншавікоў і інш. для барацьбы супраць Вял. Кастр. сацыяліст. рэвалюцыі.

Быў звязаны з А. Ф. Керанскім, які рыхтаваў паход часцей ген. Краснова на Петраград, і контррэвалюц. арг-цыямі на перыферыі, распаўсюджваў антыбальшавіцкія лістоўкі, арганізоўваў сабатаж мерапрыемстваў Сав. улады дзярж. чыноўнікамі і служачымі, падрыхтаваў і ўзначаліў мяцеж юнкераў у Петраградзе 29.10(11.11).1917. Пасля разгрому мяцяжу Сав. ўлада ліквідавала «К-т». Падобныя арг-цыі былі створаны ў канцы кастр.— ліст. 1917 у Маскве, Туле, Баку, Ніжнім Ноўгарадзе і інш. У Мінску дзейнічаў «Камітэт выратавання рэвалюцыі». З умацаваннем Сав. улады на месцах контррэвалюц. арг-цыі ліквідаваны.
Літ.: Гл. пры арт. *Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя.*

КАМІТЭТ ДЭЛЕГАТАЎ у Гомелі (Камітэт саюза чыгуначнікаў Гомельскага раёна), стачачны к-т, які кіраваў рэвалюц. барацьбой працоўных Гомеля ў час *Снежаньскага ўзброенага паўстання 1905.* Утвораны па ініцыятыве рабочых у час усеагульнай забастоўкі, якая пачалася 8.12.1905. Стварыў баявую дружыну, звергнуў прадстаўнікоў улады, звярнуўся з заклікам да забастоўкі на ўсе чыг. станцыі, спыніў рух па Палескай і Лібава-Роменскай чыгунках, 11 дзён трымаў пад кантролем горад і чыг. вузел. Спыніў дзейнасць 19.12.1905.

Кр.: Революционное движение в Белоруссии 1905—1907 гг. Документы и материалы, Мн., 1955, с. 405, 410—411, 457—460.

КАМІТЭТ ЗАМЕЖНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ РСДРП (КЗА), кіруючы орган замежных бальшавіцкіх груп, аб'яднаных у асобную арг-цыю РСДРП. Дзейнічаў пад кіраўн. У. І. Леніна.

Створаны на з'ездзе замежных бальшавіцкіх секцый і груп у сак. 1905 у Жэневе. Меў статут. Першы склад КЗА распушчаны Аб'яднаным ЦК РСДРП у сак. 1906. У снеж. 1911 у Парыжы выбраны новы КЗА. Меў прадстаўніцтва на парт. з'ездах і канфер., выдаваў і рассылаў л-ру. Адыграў важную ролю ў згуртаванні бальшавіцкіх сіл за мяжою, у барацьбе супраць меншавікоў, трацкістаў і інш. апартуністаў. У 1-ю сусв. вайну змагаўся супраць сацыял-шавіністаў, вёў рэвалюц. агітацыю сярод рус. палонных у Аўстрыі і Германіі. Існаваў да крас. 1917.
У. У. Зубец. Мінск.

КАМІТЭТ КАМСАМОЛА, выбарны орган, які кіруе дзейнасцю камсамольскай арганізацыі паміж канферэнцыямі, з'ездамі. Паводле Статута ВЛКСМ існуюць к-ты камсамола: *Цэнтральны Камітэт ВЛКСМ,* ЦК камсамола саюзных рэспублік, краявыя, абласныя, акруговыя, гарадскія, раённыя к-ты, к-ты вялікіх пярвічных арг-цый. К. к. на сваіх пленумах выбірае бюро, у т. л. сакратароў к-та. Функцыі К. к. вызначае Статут ВЛКСМ.

КАМІТЭТ МАЛАДЗЁЖНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ БССР, грамадская арганізацыя беларускай моладзі. Створаны ў кастр. 1958. У яго ўваходзяць прадстаўнікі ЛКСМБ, Рэсп. піянерскай арг-цыі імя Леніна, рэсп. добраахвотных спартыўных т-ваў, ДТСААФ, маладзёжных секцый творчых саюзаў і інш.

Падтрымлівае сувязі з маладзёжнымі саюзамі і аб'яднаннямі 23 краін свету; забяспечвае ўдзел бел. моладзі ў розных міжнар. мерапрыемствах. Па яго ініцыятыве адбыліся: у 1963 у Мінску міжнар. семінар з удзелам прадстаўнікоў з 17 краін; у 1964 «Тыдзень салідарнасці» (удзельнічала 12 краін). У 1968 у Мінску праведзена пасяджэнне клуба творчай моладзі НРБ і СССР, у 1969 — фестываль дружбы сав. і калумбійскай моладзі; арганізаваны лагер дружбы моладзі СССР і ГДР; у 1970 наладжана сустрэча дружбы і салідарнасці моладзі СССР і В'етнама. Прадстаўнікі моладзі БССР удзельнічалі ў 9 Сусв. фестывалях моладзі і студэнтаў, у міжнар. форумах, асамблеях Сусв. федэрацыі дэмакр. моладзі, кангрэсах Міжнар. саюза студэнтаў; памагалі будаваць пас. Уадыяс у Алжыры, Асуанскую плаціну ў АРЕ. К-т кожны год праводзіць пленумы. Паміж пленарнымі пасяджэннямі к-там кіруе прэзідыум. *Э. А. Лейкін.* Мінск.

КАМІТЭТ МАЛАДЗЁЖНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ СССР (да 1956 Антыфашысцкі камітэт савецкай моладзі), грамадская арганізацыя сав. моладзі. Створаны ў канцы 1941. У яго ўваходзяць прадстаўнікі ВЛКСМ, піянерскай арг-цыі імя Леніна, добраахвотных спартыўных т-ваў, ДТСААФ, маладзёжных секцый творчых саюзаў і інш. К-т удзельнічае ў рабоце Сусветнай федэрацыі дэмакратычнай моладзі, Міжнароднага саюза студэнтаў, падтрымлівае сувязі з дэмакр. арг-цыямі большасці краін свету.

КАМІТЭТ НАРОДНАГА КАНТРОЛЮ БССР, рэспубліканскі орган народнага кантролю Беларускай ССР. Утвораны ў выніку рэарганізацыі органаў парт.-дзярж. кантролю паводле за-

кону «Аб органах народнага кантролю ў Беларускай ССР», прынятага Вярх. Саветам БССР 22.12.1965.

Склад камітэта зацвярджаецца Саветам Міністраў БССР. У яго ўваходзяць: старшыня, намеснікі старшыні і члены камітэта — прадстаўнікі партыйных, савецкіх, прафсаюзных, камсамольскіх і інш. арг-цый, рабочыя, калгаснікі і служачыя, работнікі друку, дзеячы навукі і культуры, кіруючыя работнікі органаў нар. кантролю рэспублікі. Старшыня камітэта назначаецца Вярх. Саветам БССР. Камітэт працуе пад кіраўніцтвам ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР. Камітэта народнага кантролю СССР. Кіруе работай органаў нар. кантролю ў рэспубліцы, ажыццяўляе кантроль за выкананнем дырэктыў партыі і ўрада, дзярж. планаў і заданняў міністэрствамі і ведамствамі, а таксама прадпрыемствамі, калгасамі, установамі і арг-цыямі незалежна ад іх падпарадкавання. На матэрыялах праверак уносіць на разгляд ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР, а пры неабходнасці — на разгляд адпаведных устаноў і арг-цый СССР пытанні, якія патрабуюць іх рашэння. Старшыня К. н. к. БССР М. І. Лагір. Гл. таксама *Кантроль народны*.

КАМІТЭТ НАРОДНАГА КАНТРОЛЮ СССР, орган народнага кантролю ў СССР (гл. *Кантроль народны*). Утвораны 9.12.1965 у выніку рэарганізацыі органаў парт.-дзярж. кантролю.

КАМІТЭТ ПА СПРАВАХ ЗАХОДНІХ ГУБЕРНІЯЎ (Камітэт, назначаны для разгляду розных меркаванняў, якія адносяцца да вернутых ад Польшчы губерняў), дарадчы орган пры цару Мікалаю I у 1831—48.

Дзейнасць распачаў 16.9.1831. Гал. мэта — разгляд прапаноў дзярж. устаноў і дзеячаў і выпрацоўка рэкамендацый ураду, накіраваных на выкараненне перадумоў рэвалюц. і нац.-вызв. руху на Беларусі, у Літве і Правабярэжнай Украіне. Старшынямі К-та (акрамя чл. Дзярж. савета А. М. Галіцына) былі старшыні Дзярж. савета і К-та міністраў, чл.— міністры фінансаў, ваенны, унутраных спраў і вышэйшыя дзярж. саноўнікі. Па рэкамендацыях К-та прыняты ўказы пра пашырэнне на Беларусь, Літву і Правабярэжную Украіну агульнарасійскіх законаў; *інвентарныя правілы*; скасаванне Брэсцкай царкоўнай уніі 1596 (1839); узмацненне ролі праваслаўнай царквы; замену сістэмы мер Вял. кн. Літ. агульнарасійскай; павіннасці адпадворцаў; закрыццё Віленскага ун-та (1832); скасаванне пасад каморнікаў, падкаморыяў, возных і харунжых; ваенна-павятовых начальнікаў; штаты павятовых і губернскіх устаноў; пасяленне на кавённых землях рус. сялян; шляхецкі разбор і інш. Разглядаў таксама справы па антыўрадавых выступленнях, справаздачы губернатараў, прашэнні ўдзельнікаў паўстання 1830—31, кандыдатуры чыноўнікаў ва ўрадавыя ўстановы на Беларусі, у Літве і Правабярэжнай Украіне. Скасаваны 19.1.1848, функцыі перададзены К-ту міністраў.

Літ.: История Белорусской ССР, т. 1, 2 изд., Мн., 1961.

Э. М. Савіцкі. Мінск.

КАМІТЭТ ПАРТЫЙНАГА КАНТРОЛЮ ПРЫ ЦК КПСС, парт. орган, на які ўскладзены абавязак ажыццяўляць кантроль за выкананнем камуністамі парт. і дзярж. дысцыпліны; разглядаць апеляцыі на рашэнні ЦК кампартый саюзных рэспублік, краявых і абласных к-таў аб выключэнні з КПСС і парт. спагнанні.

Створаны паводле рашэння XIX з'езду КПСС у 1952 замест Камісіі парт. кантролю пры ЦК ВКП(б). Рашэннем лістападаўскага (1962) Пленума ЦК КПСС К. п. к. рэарганізаваны ў Парт. камісію пры ЦК КПСС. Лістападаўскі Пленум (1964) пастанавіў перабудаваць кіруючыя парт. органы ў адпаведнасці з Статутам КПСС. Рашэннем снежаньскага (1965) Пленума Камісія парт. кантролю рэарганіз. ў Камітэт парт. кантролю пры ЦК КПСС.

КАМІТЭТ ПАРТЫЙНА-ДЗЯРЖАЎНАГА КАНТРОЛЮ ЦК КПБ І САВЕТА МІНІСТРАЎ БЕЛАРУСКАЙ ССР, адзіны орган парт. і дзярж. кантролю ў БССР, які дзейнічаў у 1962—65. Дзейнасцю к-та кіравалі ЦК КПБ і Савет Міністраў БССР. Паводле рашэння снежаньскага Пленума ЦК КПСС (1965) рэарганізаваны ў *Камітэт народнага кантролю БССР.*

КАМІТЭТ ПАРТЫЙНА-ДЗЯРЖАЎНАГА КАНТРОЛЮ ЦК КПСС І САВЕТА МІНІСТРАЎ СССР, адзіны орган парт. і дзярж. кантролю ў СССР, які дзейнічаў у 1962—65. Створаны паводле рашэння лістападаўскага Пленума ЦК КПСС (1962). Дзейнасцю к-та кіравалі ЦК КПСС і Савет Міністраў СССР. Для расшырэння ўдзелу ў кантролі нар. мас, развіцця сацыяліст. дэмакратыі снежаньскі Пленум ЦК КПСС (1965) рэарганізаваў яго ў Камітэт народнага кантролю СССР (гл. *Кантроль народны*).

КАМІТЭТ РУСКІХ АФІЦЭРАЎ У ПОЛЬШЧЫ, рэвалюцыйная арганізацыя, якая існавала ў войсках на тэр. Польшчы, Беларусі, Літвы і Украіны. З'яўляўся федэрацыяй асобных гурткоў, якая ўзнікла ўвосень 1861. Налічваў некалькі соцень чал., па складзе быў інтэрнацыянальны (рускія, палякі, украінцы, беларусы і інш.).

Ініцыятары стварэння і кіраўнікі Я. Дамброўскі, В. Т. Каплінскі, З. Падлеўскі, А. А. Патэбня. Да арг-цыі належаў і бацька Н. К. Крупскай К. І. Крупскі. К-т стаяў на рэвалюц.-дэмакр. пазіцыях, меў цесныя сувязі з рус. рэвалюц. цэнтрам у Лондане (А. І. Герцэн, М. П. Агароў, М. А. Бакунін), ЦК *«Зямлі і волі»* ў Пецярбурзе, Цэнтральным нацыянальным камітэтам у Варшаве. У канцы 1862 цалкам увайшоў у склад «Зямлі і волі», заняваўшы аўтаномнасць. Падрыхтаваў некалькі пракламацый, якія з інш. рэвалюц. выданнямі распаўсюджваў сярод афіцэраў. У час паўстання 1863—64 усімі даступнымі сродкамі памагаў паўстанцам. Спыніў дзейнасць у сярэдзіне 1863.

Літ.: Дьяков В. А. и Миллер И. С. Революционное движение в русской армии и восстание 1863 г., М., 1964; Русско-польские революционные связи, т. 1, М., 1963; Революционная ситуация в России в 1859—1861 гг., М., 1963.

Г. В. Кісялёў. Вільнюс.

КАМІТЭТ САДЗЕЯННЯ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ (КСЧА), падпольная патрыят. арг-цыя, якая дзейнічала ў Магілёве супраць ням.-фаш. акупантаў; частка *Магілёўскага камуністычнага падполля* ў гады Вял. Айч. вайны. Пачаў складвацца ў канцы 1941 пад кіраўніцтвам пакінутага ў падполлі магілёўскага настаўніка К. Ю. *Мэтэ* і аформіўся ў арг-цыю вясной 1942. Да вясны 1943 налічваў (паводле няпоўных звестак) да 400 чал. Абнаўляў падпольныя групы: настаўнікаў (П. І. Крысевіч), чыгуначнікаў (П. І. Бялько, А. В. Гарошка), аўтатранспартнікаў (А. І. Шубадзёраў), рабочых хлебазавода (М. М. Яўхіеў), аўтарамазавода (В. І. Батура, М. І. Харкевіч), супрацоўнікаў бальніцы (М. П. *Кушынаў*), ваен. шпіталю (І. Г. Гурыеў), б. ваеннаслужачых (В. Дз. Швагрынаў), ляспіцтва (І. В. Лусцянкоў, П. П. Балашэнка), моладзі (І. М. Лысіковіч, Р. Д. Радзіёнаў, М. М. Фралоў), асобныя групы У. П. Харытонава, І. С. Малашкевіча, С. Л. Шугалея і інш. Групы будаваліся па прынцыпе «ланцужкоў» — кожны ведаў 2—3 чл. групы. Кіраўнікі ўсіх груп, звязаныя з Мэтэ, складалі кіруючае ядро КСЧА. З лета 1942 КСЧА працаваў пад

кіраўніцтвам камандзіраў партыз. атрадаў Н. Д. Аляр'янава, К. М. Белавусава, *Клічаўскага аператыўнага цэнтра*, з восені 1942 — упаўнаважанага ЦК КП(б)Б па Магілёўскай вобл. І. М. Кардовіча. Выдаваў газ. «За Родину» (з восені 1942 «За Советскую Родину»). Чл. КСЧА распаўсюджвалі агіт. л-ру, перапраўлялі партызанам людзей, зброю, медыкаменты, харчаванне, перадавалі звесткі разведкі, рабілі дыверсіі на чыгункі, станцыі, прадпрыемствах і ваен. аб'ектах. У канцы 1942 і ў сак.— маі 1943 акупанты арыштавалі вял. групу актыўных чл. КСЧА. У сувязі з гэтым Мэтэ і некат. кіраўнікі груп пайшлі ў партыз. атрады. Кіраўніком КСЧА стаў Крысевіч. Пасля арыштаў у маі 1943 КСЧА практычна спыніў існаванне. У фаш. катавальнях загінула шмат яго актыўных членаў, у т. л. Г. А. Іванова, А. Ф. Магілёвец-Чуліцкая, Г. А. Захаран, В. М. Карпінская, М. Я. Новікаў. Многія члены КСЧА ўзнаг. ордэнамі і медалямі, Л. Дз. *Лорчанку* прысвоена званне Героя Сав. Саюза. Імем Т. Р. Карпінскай названа вуліца ў Магілёве. .

Літ.: Солдатами были все, Мн., 1968, с. 273—337; Герои подполья, в. 1, 3 изд., М., 1970.

А. А. Кузняёў. Мінск.

КАМІТЭТЫ БЕДНАТЫ (камбеды), арганізацыі вясковай беднаты, апорныя пункты дыктатуры пралетарыяту на вёсцы, створаныя паводле дэкрэта ВЦВК і СНК РСФСР ад 11.6.1918 на тэр. Еўрап. Расіі, у т. л. і на неакупаванай тэр. Беларусі.

Права выбіраць і быць выбранымі ў К. б. мелі вясковыя жыхары, выключаючы кулакоў і асоб, якія валодалі гандлёва-прамысл. прадпрыемствамі і карысталіся наёмнай працай. Дзейнасць камбедаў накіроўвалі парт. органы і рабочыя харч. атрадаў. К. б. перазмяркоўвалі на карысць беднякоў і сераднякоў канфіскаваную ў памешчыкаў зямлю і с.-г. інвентар, арганізоўвалі камуны і інш. с.-г. аб'яднанні; каб забяспечыць гарадское насельніцтва і Чырв. Армію харч. прадуктамі, канфіскоўвалі ў кулакоў лішкі хлеба; праводзілі мабілізацыю і набор добраахвотнікаў у Чырв. Армію; вялі культ.-асвет. работу; ажыццяўлялі дэкрэты і распараджэнні Сав. улады, згуртоўвалі сялян-беднякоў вакол рабочага класа; памагалі Сав. дзяржаве ізаляваць кулацтва і схіліць на бок Сав. улады серадняка, ажыццяўляць Дэкрэт аб зямлі.

Пры садзеянні камбедаў 50 (з 80) млн. *га* памешчыцкай і кулацкай зямлі перайшло ў рукі беднаты і сераднякоў. У неакупаваных раёнах Магілёўскай губ., у Віцебскім і Гарадоцкім пав. у 1918 дзейнічала больш за 1880 вясковых, валасных, местачковых К. б. Да ліст. 1918 у 33 губ. Еўрап. Расіі і на Беларусі створана 122 тыс. К. б. Камбеды адыгралі вял. ролю ў барацьбе з кулацтвам і ў развіцці сацыяліст. рэвалюцыі ў вёсцы. Падрыў уплыву кулацтва, перамогі Чырв. Арміі спрыялі пераходу сераднякоў на бок Сав. улады. Выканаўшы свае задачы, К. б. ў канцы 1918 зліліся з сельскімі Саветамі. На вызваленай ад ням. акупантаў тэр. Беларусі арганізацыя камбедаў цягнулася да сак. 1919. Яны актыўна ўдзельнічалі ў аднаўленні Сав. улады, ахове парадку. Зліліся з Саветамі на працягу 1919.

Літ.: Ленін У. І. Прамова да дэлегатаў камітэтаў беднаты Маскоўскай вобласці 8 лістапада 1918 г., Тв., т. 28 (Полн. собр. соч., т. 37); его же, Прамова на I Усерасійскім з'ездзе земельных аддзелаў, камітэтаў беднаты і камун 11 снежня 1918 г., Тв., т. 28 (Полн. собр. соч., т. 37); Комитеты бедноты, т. 1—2, М.— Л., 1933; Комитеты бедноты Белоруссии, Мн., 1958.

І. В. Царук. Мінск.

КАМІЧНАЕ (грэч. komikós смешны), эстэтычная катэгорыя, якая адлюстроўвае неадпаведнасць паміж недасканалым, састарэлым зместам з'явы або прадмета і яго формай, што прэтэндуе на паўнацэннасць і значнасць. К. з'яўляецца асаблівай формай выражэння сацыяльных супярэчнасцей. Яно выяўляецца, напр., тады, калі агіднае, гістарычна асуджанае, бесчалавечнае і нізкае выдае сябе за прыгожае, гуманнае і высокае. «Гісторыя дзейнічае грунтоўна і праходзіць праз мноства фазісаў, калі забірае ў магілу састарэлую форму жыцця. Апошні фазіс сусветна-гістарычнай формы ёсць яе камедыя» (Маркс К. и Энгельс Ф. Об искусстве, т. 1, М., 1967, с. 45). К. выяўляецца толькі ў грамадстве, у адносінах чалавека да рэчаіснасці, у эстэт. ацэнцы, абумоўленай гістарычнымі, класавымі, нацыянальнымі, індывідуальна-псіхал. фактарамі. К. ў мастацтве намагае разбураць старое, аджылае і разам з тым імкнецца ствараць новае, прагрэсіўнае, жыццяздольнае. Разнастайнасць выяўлення К. ў жыцці абумоўлівае розныя формы яго адлюстравання ў мастацтве — ад *гумару* і мяккай іроніі да *сатыры* і сарказму. Камічныя жанры ўласцівыя ўсім відам л-ры і мастацтва (*камедыя, пародыя, фельетон, памфлет, карыкатура, шарж*).

Літ.: Маркс К. и Энгельс Ф. Об искусстве, т. 1—2, М., 1967; Чернышевский Н. Г. Возвышенное и комическое, Полн. собр. соч., т. 2, М., 1949; Борев Ю. О комическом, М., 1957.

У. М. Конан. Мінск.

КАМО [парт. псеўд. Тэр-Петрасяна Сімона Аршакавіча; 15(27).5.1882, Горы Тыфліскай губ.— 14.7.1922], прафесійны рэвалюцыянер. З сям'і дробнага гандляра. Чл. КПСС з 1901. Рэвалюц. дзейнасць пачаў у 1901, распаўсюджваў нелег. л-ру, арганізоўваў падпольныя друкарні. Пасля II з'езду РСДРП (1903) бальшавік. У час Снежаньскага ўзбр. паўстання 1905 узначальваў у Тыфлісе атрад рабочых. Па даручэнні У. І. Леніна закупляў зброю за мяжою (у Германіі, Швецыі, Бельгіі, Балгарыі), транспартаваў у Расію парт. л-ру. У 1903, 1905, 1907, 1912 арыштоўваўся; у 1912 прыгавораны да пакарання смерцю, заменена 20 гадамі катаргі. Пасля Лют. рэв. 1917 вызвалены. У 1918 прывёз у Тыфліс ліст Леніна і пастанову СНК РСФСР аб прызначэнні С. Г. *Шаўмяна* часовым надзвычайным камісарам Каўказа. Летам 1919 К. стварыў партыз. атрад, які дзейнічаў у тыле войск Дзянікіна на Паўд. фронце. Удзельнік падрыхтоўкі ўзбр. паўстання ў крас. 1920 у Баку. У 1921—22 у СНК, у сістэме знешняга гандлю, наркамфіне Грузіі. Загінуў у аўтамаб. катастрофе.

Літ.: Ленин В. И. Письмо Э. М. Склянскому и И. Т. Смиллге. Лето 1919, Полн. собр. соч., т. 51; Горький М. Камо, Собр. соч., т. 17, М., 1952; Шаумян Л. С. Камо, М., 1959; Бібінейшвілі І. Камо, Мн., 1936.

КАМОРА, 1) традыцыйнае данамоннае памяшканне, у якім хаваюць прадукты, асабліва малочныя і мясныя, а таксама вопратку, рэчы хатняга ўжытку. У беларусаў К. (каморка, кладоўка) звычайна прыбудоўвалася да

сяней ці адгароджвалася ў іх. Пашырана на ўсёй Беларусі, найболей на З і ПдЗ. 2) Даўней — кантора пры лясніцтве. 3) У 15—18 ст. на Беларусі — таможня.

КАМОРНІКІ, катэгорыя феадальна-залежнага насельніцтва Беларусі, Украіны, Літвы і Польшчы ў 13—19 ст., якая не мела зямлі і ўласнага дома. Фарміраваліся пераважна з сельскага насельніцтва.

Назву атрымалі ад каморы (пакоя), якую наймалі для жылля. Існавалі за кошт наёмнай працы ў феадалаў і заможных сялян, рамяства або дробнага гандлю. К.— людзі неаселыя і, шукаючы заработку, пераходзілі з месца на месца. На Беларусі тэрмін К. больш пашыраны быў у зах. і цэнтр. частцы; на У яны часта называліся падсуседзямі (16 — 1-я пал. 17 ст.); кутнікамі (ад слова кут) і бабылямі (2-я пал. 17 ст.— 1-я пал. 19 ст.). У параўнанні з інш. катэгорыямі сялян колькасць К. была нязначная. Асн. павіннасць К.— чынш, памер якога залежаў ад іх плацежаздольнасці. З пашырэннем панскай гаспадаркі (канец 18 ст.) колькасць іх паменшала. У 2-й пал. 19 ст. К. зліліся з агульнай масай сялянства.

Літ.: Похилевич Д. Л. Крестьяне Белоруссии и Литвы в XVI—XVIII вв., Львов, 1957, с. 80—81; яго ж. Малоземельное и безземельное сельское население в Русском воеводстве Речи Посполитой в XVI в., у кн.: Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы. 1961 г., Рига, 1963, с. 37—38; яго ж. Плебейский люд (лезные) в деревне Речи Посполитой, у кн.: Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы, 1962 г., Мн., 1964, с. 165—167. *В. І. Малешка.* Мінск.

КАМОРСКІЯ АСТРАВЫ (франц. Îles Comores, ад араб. камр — месяц), група астравоў у Мазамбікскім праліве Індыйскага ак. Пл. 2171 км². Нас. 270 тыс. чал. (1969): анталаутра (каморцы), малагасійцы, банту, індыйцы. К. а. належаць Францыі, з 1961 маюць статус «заморскай тэрыторыі», а з 1968 унутранае самакіраванне. Вулкан. паходжання, складзены з базальтаў. Паверхня гарыстая (выш. да 2560 м), ёсць дзейныя вулканы. Клімат трапічны, вільготны. Трапічныя лясы. Вырошчваюць рыс, цукр. трыснёг, ямс, гваздзік, каву, бананы. Жывёлагадоўля. Паўсаматужныя прадпрыемствы для перапрацоўкі с.-г. сыравіны. Адм. ц. Марані. К. а. адкрыты мараплаўцам К. Хаўтманам у 1598.

КАМОСКІ, вёска ў Бешанковіцкім с/с Бешанковіцкага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Палітаддзелец». За 5 км на З ад Бешанковіч, 56 км ад Віцебска, 20 км ад чыг. ст. Шуміліна, на аўтамаб. дарозе Віцебск — Лепель. 163 ж., гасп. 62 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, магазін. У 1941 ням.-фаш. захопнікі спалілі палову вёскі. Помнік 72 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.



КАМОЭНС, правільней Камоінш (Camões) Луіш ды (снежань 1524 або студзень 1525, Лісабон — 10.6.1580), партугальскі паэт, прадстаўнік партуг. л-ры Адраджэння. З стараж. дваранскага роду. Ваяваў салдатам у Марока (1549—51). За дуэль высланы ў Індыю (1553—70). Аўтар санетаў, напісаных у манеры Ф. Петраркі, і п'ес «Камедыя пра Амфітрыёнаў» (апубл. 1587), «Цар Селеўк» (апубл. 1645) і «Філадэма» (апубл. 1587). У асн. творы — эпічнай паэме ў 10 песнях «Лузіяды» (1572) — апяваў гераізм партуг. народа; у цэнтры паэмы — падарожжа Васка да Гамы, які праклаў шлях вакол Афрыкі ў Індыю. Нягледзячы на міфалаг. і фантаст. элементы паэмы, у ёй даюцца рэаліст. замалёўкі марской буры, экзатычных пейзажаў, побыту, нораваў жыхароў Афрыкі і Індыі, востра выкрываюцца сац. заганы — прыдворная мараль, жорсткасць правіцеляў, улада золата.

Тв.: Рус. пер.— Сонеты, М., 1964.

КАМПАЗІЦЫЙНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ, матэрыялы, што складаюцца з некалькіх кампанентаў з рознымі фізіка-механічнымі ўласцівасцямі. З К. м. выраблюць дэталі апаратаў і канструкцый, да якіх ставіцца патрабаванне павышанай трываласці (жаратрываласці) пры адносна невялікіх памерах і масе.

У залежнасці ад формы кампанентаў адрозніваюць К. м. слаістыя (напр., *біметал*) і валакністыя. Звычайна К. м. складаюцца з дзвюх трывала злучаных кампанентаў — матрыцы з пластычнага матэрыялу і полікрышталічных валокнаў графіту, бору і г. д. або ніцепадобных крышталяў некат. вокіслаў, карбідаў, нітрыдаў, якія характарызуюцца высокай трываласцю і жорсткасцю, малой шчыльнасцю і вял. тугаплаўкасцю. Трываласць К. м. залежыць ад аб'ёмнага ўтрымання валокнаў, якія ўспрымаюць асн. нагрузку; пры гэтым матэрыял матрыцы перадае нагрузку валокнам датычнымі напружаннямі. Атрымліваюць К. м. вакуумнай пракаткаю ці прапіткаю, спосабамі парашковай металургіі, выбухам, накіраванай крышталізацыяй сплаваў і г. д. На Беларусі работы па стварэнні К. м. і даследаванні іх фіз.-мех. уласцівасцей праводзіць Фіз.-тэхн. ін-т АН БССР.

Літ.: Современные композиционные материалы, пер. с англ., М., 1970; Перспективные композиционные материалы. Сб. ст., пер., [М.], 1968; Волокнистые композиционные материалы, пер. с англ., М., 1967. *А. С. Матусевіч.* Мінск.

КАМПАЗІЦЫЯ (лац. compositio складанне, стварэнне), будова (структура) мастацкага твора. У музыцы — тое самае, што *музычная форма*. У выяўл., дэкар.-прыкладным мастацтве і архітэктуры К. арганізуе размяшчэнне і ўзаемасувязь фарбавых плямаў (колеравая К.), ліній святла і цяню, сэнсавых акцэнтаў, узаемаадносін твора з навакольлем, ход яго ўспрымання гледачом.

З К. узгадняюцца рытм, прапорцыі, асаблівасці будовы прасторы, формаў, маштабы твора. Найб. поўна ўласцівасці і роль К. выяўляюцца ў тэмат. карціне. Тут асн. прызначэнне К.— раскрыць ідэйны замысел маст. твора дэталёвай распрацоўкай сюжэтнага дзеяння з дапамогаю спецыф. сродкаў і прыёмаў. К. можа быць статычная (пры рэалізавазе фармальных элементаў твора, сіметрычным іх размяшчэнні), дынамічная (пры панаванні дыяганаляў, асіметрыі будовы, фрагментаванні выявы), адкрытая (пры панаванні цэнтрабежных сіл у размяшчэнні элементаў, пры неакрэсленых межах выявы) і замкнёная (калі ў будове пануюць цэнтраімклівыя сілы, якія сцягваюць усе элементы твора да цэнтра). К. наз. таксама шматфігурная карціна, скульптурная група ці рэльеф, муз. твор. Тэрмін ужываецца і для абазначэння стварэння музыкі як віда маст. творчасці.

У літаратуры К.— адзін з сродкаў выяўлення ідэйна-тэматычнага зместу літ. твора; структура, абумоўленая зместам, набудова твора, размяшчэнне і ўзаемасувязі яго частак — кампанентаў (апісанні, характарыстыкі, партрэты, дыялогі, маналогі, лірычныя ад-





ступленні і інш.), парадак разгортвання падзей і групоўка персанажаў. Часам у значэнні К. ўжываецца тэрмін «архітэктоніка».

КАМПА́ЛА (Kampala), сталіца Рэспублікі Уганды. Размешчана на Пд краіны, каля воз. Вікторыя. Вузел шашэйных дарог. Злучаны чыгункай з кенійскім портам Мамбаса. Гандлёва-прамысл. і фін. цэнтр краіны. 170 тыс. ж. (1969). Бавоўнаачышчальныя, тэкст., гарбарныя, кававыя і тытунёвыя прадпрыемствы; лесапільны і цэментавыя з-ды. У К. старадаўні форт, этнагр. музей, Нац. тэатр, у прыгарадзе універсітэцкі коледж.

КАМПАНЕ́ЛА (Campanella) Джавані Даменіка (манашскае Тамаза; 5.9.1568, г. Стыла ў Калабрыі — 21.5.1639), італьянскі філосаф, адзін з прадстаўнікоў ранняга утапічнага камунізма. З сям'і дробнага рамесніка. У 1599 за вальнадумства і арганізацыю змовы супраць іспанскага прыгнёту ў Неапалітанскім каралеўстве засуджаны да пажыццёвага зняволення. 27 гадоў правёў у турмах, дзе напісаў большасць сваіх твораў, у т. л. «Горад Сонца» (1602) — адзін з першых класічных твораў утапічнага камунізма. У ім апісаў ідэальнае камуніст. грамадства, дзе няма сац. няроўнасці і прыгнёту. Усе грамадзяне займаюцца прадукцыйнай працай, пануе прынцып размеркавання прадуктаў па патрэбах. Адсутнасць прыватнай уласнасці прывяла да нябачанага росквіту навукі, тэхнікі, мастацтва. Гістар. абмежаванасць утопіі К. ў тым, што ён пакідаў у ідэальным грамадстве рэлігію, правіцеляў — свяшчэннікаў, прапаноўваў выкарыстоўваць астралогію, магію і інш. Аднак утапічны камунізм К.— важны этап у развіцці сацыяліст. думкі. У філасофіі К. матэрыяліст. тэндэнцыі спалучаюцца з рэшткамі схаластычнага мыслення, матэрыялізм набывае форму пантэізму.



Тв.: Рус. пер.— Об ощущении вещей, у кн.: Деборин А. Книга для чтения по истории философии, т. 1, М., 1924; Город Солнца, М., 1954.

Літ.: Лафарг П. Томас Кампанелла, М.— Л., 1926; Волгин В. П. Кампанелла-коммунист, у яго кн.: Очерки по истории социализма, 4 изд., М.— Л., 1935; Горфункель А. Х. Томмазо Кампанелла, М., 1969 (бібліягр.); Баткин Л. М. Парадокс Кампанеллы, «Вопросы философии», 1971, № 2.

М. І. Іоська. Мінск.

КАМПА́НСКІ ВЕК (ЯРУС), позні век познемелавой эпохі (трэці зверху ярус верхняга аддзела) *мелавога перыяду (сістэмы)*. Вылучаны Г. Каканам у 1857 у Шампані (Францыя). Адклады К. я. пашыраны на значнай ч. тэр. СССР. На Беларусі вядомы на невялікай плошчы на З і У. Складзены з мергельна-мелавых парод.

КАМПАРА́ТАРЫ (ад лац. comparo параўноўваю), вымяральныя прылады для параўнання тых велічынь, што вымяраюцца, з эталоннымі. Бываюць аптычныя, электрычныя, пнеўматычныя і інш. Аптычныя К. выкарыстоўваюцца для асабліва дакладнай зверкі мер даўжыні.

КАМПЕНСА́ТАР механічны (ад лац. compenso ураўнаважваю), прыстасаванне, з дапамогаю якога кампенсуюць адхіленні ў памерах інш. дэталяў, каб забяспечыць зададзеныя памеры пры зборцы і эксплуатацыі машын, прылад, механізмаў.

Адрозніваюць К. рухомыя (клíны, спружыны, зубчастыя ўтулкі) і нерухомыя (пракладкі, кольцы, шайбы). Да рухомых адносяцца К., якія перыядычна рэгулююць, і К. аўтам. дзеяння (напр., двайны шарнір, які кампенсуе несувоснасць дзвюх частак вярчальнага вала). Ужыванне К. дае магчымасць выкарыстоўваць паточныя метады зборкі машын, павялічваць допускі на памеры дэталяў, павышаць эксплуатацыйныя якасці машын.

КАМПЕНСА́ЦЫЯ (лац. compensatio пакрыццё), у савецкім працоўным праве выплата грашовых сум рабочым і служачым на пакрыццё зробленых імі матэрыяльных ці іншых затрат. Прызначаецца пры камандзіроўках, звышурочных работах, пераводзе на работу ў інш. мясцовасць, накіраванні на работу маладых спецыялістаў, за работу ў святочныя і выхадныя дні (гл. таксама *Адгул*), за амартызацыю інструментаў, якія належаць работніку, і інш.

КАМПЕТЭ́НЦЫЯ (лац. competens адпаведны), сукупнасць паўнамоцтваў (правоў і абавязкаў) якога-н. органа або службовай асобы; кола пытанняў, у якіх асоба мае веды, вопыт.

КАМПО́СТЫ (італьян. composta, ад лац. compositus састаўны), арганічныя ўгнаенні, якія складаюцца з сумесі перагнілых арганічных матэрыялаў (торф, гной, салома, адходы і адкіды сельскай гаспадаркі, прамысловасці і інш.). У К. часта дадаюць драўняны попел, фасфарытную муку, вапну і калійныя солі.

Пры кампаставанні арган. кампаненты паслойна або ў сумесі складваюць у штабелі. У выніку жыццядзейнасці мікраарганізмаў яны ператвараюцца ў масу, якая часткова мінералізуецца і абагачаецца каштоўнымі лёгкараствaральнымі пажыўнымі рэчывамі. К. бываюць торфа-гноевыя, торфа-попельныя, торфа-жыжкавыя, торфа-фасфарытныя, гноева-фасфарытныя і інш. На Беларусі найб. ужываюцца торфа-гноевыя К. з дабаўкаю фасфарытнай мукі і калійных угнаенняў. Суадносіны паміж гноем і торфам ад 1 : 1 да 1 : 2. Такія К. амаль раўнацэнныя гною.

Літ.: Прянишников Д. Н. Избр. соч., т. 1, М., 1965; Мамченков П. П. Органические удобрения, М., 1965.

І. В. Філіпенка. Жодзіна.

КАМПРАДО́РЫ (ісп. comprador пакупнік), частка мясцовай буржуазіі ў каланіяльных і паўкаланіяльных краінах Азіі, Афрыкі, Лац. Амерыкі, якая пасрэднічае паміж замежным капіталам і ўнутраным рынкам. У эпоху імперыялізму сац. апора манапалій імперыял. дзяржаў. У 20 ст. К. называюць мясцовую бурж. агентуру імперыялістаў, якая стрымлівае нац.-вызв. рух.

КАМПРЭ́САР (ад лац. compressio сцісканне), машына для сціскання газаў да ціску больш за 0,2 *Мн/м²* (2 *кгс/см²*).

Адрозніваюць К. статычнага сціскання, у якіх газ сціскаецца ад памяншэння замкнёнага аб'ёму, і дынамічнага сціскання, у якіх кінетычная энергія газаў ператвараецца ў патэнцыяльную энергію ціску. Паводле канструкцыйных адзнак К. статычнага сціскання падзяляецца на поршневыя і ратацыйныя, К. дынамічнага сціскання — на цэнтрабежныя і восевыя. У поршневых К. сцісканне газаў

адбываецца памяншэннем аб'ёму газу, абмежаванага сценкамі цыліндра і поршнем, які перамяшчаецца ў цыліндры; у ратацыйных — памяншэннем аб'ёму, абмежаванага сценкамі вярчальных рабочых камер. У цэнтрабежных К. (гл. рыс.) газ, што пераходзіць з накіравальнага апарата *2* у вярчальнае рабочае кола *1*, перамяшчаецца паміж лапатак *3*. Потым газ пераходзіць у дыфузар *4*, дзе скорасць яго памяншаецца, а ціск павялічваецца. У восевых К. газ перамяшчаецца паралельна восі рабочага кола. Цэнтрабежныя і восевыя К. звычайна робяць шматступеньчатымі. К. статычнага сціскання забяспечваюць вял. перапады ціску пры адносна невялікай прадукцыйнасці, К. дынамічнага сціскання — наадварот (вял. прадукцыйнасць пры адносна невялікіх перападах ціску). Паветраныя К. забяспечваюць паветрам пнеўматычныя інструменты, апараты і прылады; газавыя К. (азотныя, амілачныя, кіслародныя, фрэонавыя і інш.) выкарыстоўваюцца ў азотнай, кіслародная вытворчасці і ў халадзільных установах. К. ўжываецца таксама для перапампоўвання газаў па газаправодах, у турбарэактыўных і турбавінтавых рухавіках і газатурбінных установах, на падводных, дарожных і інш. работах, у тармазных сістэмах транспартных машын, для доменнага выдзялення і г. д.



Ступень цэнтрабежнага кампрэсара.

Літ.: Чистяков Ф. М. и др. Центробежные компрессорные машины, М., 1969; Раков А. А. и Виноградов Ю. А. Компрессоры. Краткое справочное пособие, М., 1965; Головинцов А. Г. и др. Ротационные компрессоры, М., 1964; Рыжов Б. М. Авиационные поршневые компрессоры, М., 1963. *Б. С. Мельнікаў.* Мінск.

КАМСАМО́Л, гл. *Усесаюзны Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі, Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі Беларусі, Камуністычны Саюз Моладзі Заходняй Беларусі.*

КАМСАМО́ЛЬСК, Камсамольская (да 1935 Дзюрдзеў), вёска ў Рэчыцкім р-не Гомельскай вобл., каля р. Бярэзіна (2,5 *км*). Цэнтр сельсавета і саўгаса «Камсамольскі». За 35 *км* на ПнЗ ад Рэчыцы, 85 *км* ад Гомеля, 20 *км* ад чыг. ст. Дземяхі, каля аўтамаб. дарогі г. п. Васілевічы — в. Горваль (1 *км*). 454 ж., дваро́ў 169 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, дзіцячы сад, швейная майстэрня. У 1943 вёску і 7 мірных жыхароў спалілі ням.-фаш. захопнікі.

КАМСАМО́ЛЬСКАЕ ВО́ЗЕРА (Мінскае возера), штучны вадаём у бас. р. Свіслачы, правага прытока Бярэзіны, на паўн.-зах. ускраіне Мінска. Створана ў 1941 плацінаю на Свіслачы. Пл. 0,60 *км*². Даўж. 5 *км*, найб. шыр. 0,3 *км*, сярэдняя 0,12 *км*, найб. глыб. 2,6 *м*. Катлавіна К. в.— затопленая пойма ракі. Берагі супясчаныя, выш. да 5 *м*. Дно возера пераважна пясчанае, часткова галечнае або ілістае. У верхняй ч. вадаёма невял. астравы. Вадазбор (742 *км*²) у межах Мінскага ўзвышша. К. в. ўваходзіць у склад *Вілейска-Мінскай воднай сістэмы*. Месца адпачынку працоўных. Водзяцца плотка, акунь, джгір, карась, верхаводка. *К. К. Крыловіч.* Мінск.

КАМСАМО́ЛЬСКАЯ (да 1964 Пукава), вёска ў Капыльскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Леніна. За 22 *км* на ПнУ ад Капыля, 103 *км* ад Мінска, 32 *км* ад чыг. ст. Цімкавічы, каля аўтамаб. дарогі г. Нясвіж — в. Шыпчыцы (0,5 *км*). 553 ж., дваро́ў 180 (1971). Адда. раённага камбіната быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аптэка, фельч.-ак. пункт, магазін. У 1943 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі. Тры помнікі: на брацкай магіле сав. воінаў, якія загінулі ў ліп. 1941; 46 мірным жыхарам вёскі, закатаваным у вер. 1942 ням.-фаш. карнікамі; землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

КАМСАМО́ЛЬСКІЯ ПАДПО́ЛЬНЫЯ АРГАНІЗА́ЦЫІ ў гады Вялікай Айчыннай вайны, нелегальныя камсамольскія арганізацыі на часова акупаванай ням.-фаш. захопнікамі тэр. СССР у 1941—44. Ствараліся парт. і камсамольскімі арганізацыямі да пачатку акупацыі і ў тыле ворага, а таксама ўзніклі самастойна. Найб. масавыя і шматлікія былі на Беларусі, Украіне, у Смаленскай, Бранскай, Арлоўскай, Калінінскай, Ленінградскай абл. Працавалі пад кіраўніцтвам падпольных парт. органаў, ЦК, абкомаў, міжрайкомаў і райкомаў ВЛКСМ. Вялі арганізатарскую і паліт.-выхаваўчую работу сярод моладзі, уздымалі яе на ўсенародную барацьбу супраць ням.-фаш. захопнікаў. Рыхтавалі партыз. рэзервы, вялі дыверсійную і разведвальную работу, здабывалі і перадавалі партызанам зброю, боепрыпасы, медыкаменты; ратавалі мірнае насельніцтва ад знішчэння і вывазу на катаржныя работы ў Германію; умацоўвалі веру сав. людзей у перамогу над ворагам, распаўсюджвалі праўдзівую інфармацыю, лістоўкі, газеты; былі ініцыятарамі найб. эфектыўных метадаў барацьбы з ворагам. Разам з камуністамі камсамольцы былі сілай, што цэментавала партыз. атрады і падпольныя антыфашысцкія арганізацыі.

На Беларусі напярэдадні вайны было 15 790 пярвічных камсамольскіх арг-цый, якія аб'ядноўвалі 264 620 чл. ЛКСМБ. У чэрв.— жн. 1941 добраахвотна і па мабілізацыі ў Чырв. Армію і на флот пайшло больш за 130 тыс. чал., 1500 накіравана ў групы разведчыкаў Зах., Цэнтр. і Бранскага франтоў. Парт. органы, ЦК і абкомы ЛКСМБ пакінулі ці накіравалі ў тыл ворага для партыз. і падпольнай дзейнасці каля 5 тыс. камсамольцаў (паводле няпоўных звестак). У падполлі на Беларусі засталося больш як 1400 пярвічных камсамольскіх арг-цый. На канец 1942 у камсамольскіх арг-цыях партыз. фарміраванняў было каля 20 тыс., а ў падпольных арг-цыях звыш 6 тыс. камсамольцаў. У 1943—44 у чл. ЛКСМБ штомесяц уступала 1,5—2 тыс. партызанаў. Усяго ў партыз. фарміраваннях на Беларусі дзейнічала каля 2600 пярвічных камсамольскіх арг-цый, у падполлі — каля 3 тыс., у маладзёжных антыфаш. арг-цыях — 335. Яны аб'ядноўвалі каля 100 тыс. камсамольцаў. Кіраваў імі ЦК ЛКСМБ, 20 чл. і канд. якога, у т. л. сакратары ЦК М. В. Зімянін, К. Т. Мазураў, Ф. А. Сурганаў, чл. бюро ЦК ЛКСМБ М. П. Барашкаў, а таксама 11 інструктараў працавалі ў тыле ворага. На акупаванай тэр. БССР дзейнічала 10 падпольных абкомаў, 10 міжрайкомаў, 12 гаркомаў і 188 райкомаў ЛКСМБ. Работа К. п. а. была ў цэнтры ўвагі ЦК КП(б)Б, падпольных парт. органаў і арг-цый, камандавання партыз. фарміраванняў. Многія камсамольцы былі арганізатарамі і камандзірамі партыз. атрадаў, камандзірамі і камісарамі брыгад (А. А. Бірукоў, М. І. Герасімаў, Дз. А. Дзенісенка, Ф. І. Дзернушкоў, В. І. Лівенцаў, М. Г. Мармулёў, П. М. Машэраў, Б. А. Мічурын, І. Я. Палякоў, Д. Ф. Райцаў, У. А. Ціхаміраў і інш.). Па ініцыятыве камсамольцаў Віцебскай вобл. ў партыз. атрадах на Беларусі створаны камсамольска-маладзёжныя дыверсійныя групы, якія з дапамогаю падпольшчыкаў арганізавалі 5800 крушэнняў эшалонаў праціўніка, знішчылі каля 3 тыс. мастоў, 133 склады з ваен. маёмасцю, узарвалі больш за 70 тыс. рэек, пашкодзілі 17 самалётаў, 200 танкаў і бронемашын, падрыхтавалі каля 1600 падрыўнікоў. У барацьбе з ворагам камсамольцы паказвалі мужнасць і самаахвярнасць. Разам з варожымі эшалонамі свядома падарвалі сябе камсамольцы М. П. Андрыевіч з Асіповіцкага партыз. злучэння, Д. Б. Вярэка з партыз. палка 208-га, М. В. Гойшык з партыз. брыгады імя Дзяржынскага Брэсцкай вобл., С. Ф. Казятнікаў і С. Чачэрын з партыз. брыгады імя газ. «Правда» Мінскай вобл.

Камсамольскія арг-цыі партыз. фарміраванняў будаваліся паводле прынцыпу арг-цый Чырв. Арміі. Захоўвалася выбарнасць к-таў і групоргаў малых падраздзяленняў, якія перыядычна на сходах давалі справаздачу пра работу. На сходах абмяркоўвалі аперацыі, пытанні баявой і масава-паліт. дзейнасці, жыцця і быту камсамольцаў, чыталіся лекцыі, даклады. З восені 1942 праводзіліся міжбрыгадныя і раённыя камсамольскія канферэнцыі, сходы актыву, раённыя і абл. нарады кіруючых камсамольскіх работнікаў. Падпольныя абкомы, міжрайкомы, гаркомы і райкомы назначаліся. К. п. а. захоўвалі строгую канспірацыю.

Дзейнічалі К. п. а. ва ўсіх гарадах Беларусі і ў многіх нас. пунктах. Найб. баявым і шматлікім было камсамольскае падполле ў Мінску — каля 70 камсамольска-маладзёжных арг-цый і груп аб'ядноўвалі больш за 1 тыс. чал. (гл. ў арт. *Мінскае камуністычнае падполле*). У Гомелі і прыгарадах пад кіраўніцтвам падпольнага гаркома ЛКСМБ дзейнічала больш за 20 арг-цый і груп (гл. ў арт. *Гомельскае камуністычнае падполле*). Мужна змагаліся супраць акупантаў К. п. а. Магілёва, Віцебска, Гродна, Брэста, Баранавіч, Ліды, Барысава, Бабруйска, Оршы, Жлобіна, Асіповіч, Пінска, Скідаля, Калінкавіч, Мазыра, Ваўкавыска, Полацка, Узды, Васілевічаў, Хойнікаў, Круглага, Турава, Обалі, Асінторфа і інш. (Пра дзейнасць камсамольскага падполля гл. адпаведныя арт. пад назвай, напр., *Асінторфскае камсамольскае падполле*, а таксама ў арт. пра камуніст. падполлі.) У 1943—44 К. п. а. Беларусі выдавалі і распаўсюджвалі ў варожым тыле 8 камсамольска-маладзёжных газ.: «Чырвоная змена», «Сталінская молодежь», «Молодой партизан», «Молодой мститель», «Молодежь Белоруссии в борьбе за Родину», «Молодежная правда», «Сталинское племя», «Партизан-комсомолец». Распаўсюдзілі больш за 3,5 млн. лістовак, выдадзеных ЦК ЛКСМБ, газет і інш. выданняў. У партыз. краях і зонах, у цывільных лагерах, дзе хаваліся пад абаронай партызанаў многія сем'і, па ініцыятыве камсамольцаў былі створаны школы для дзяцей. Пасля вызв. Беларусі камсамольцы-партызаны і падпольшчыкі пайшлі ў Чырв. Армію, удзельнічалі ў адбудове разбуранай ням. акупантамі нар. гаспадаркі. За баявыя заслугі ў Айч. вайне камсамол Беларусі ўзнаг. ордэнам Чырв. Сцяга, Любанская раённая арг-цыя Мінскай вобл. — ордэнам Айч. Вайны 1-й ступені. Камсамольская арг-цыя 13-га атрада Лепельскай партыз. брыгады Віцебскай вобл. атрымала на вечнае хаванне пераходны Чырв. сцяг ЦК ВЛКСМ, прысуджаны лепшай камсамольскай арг-цыі партыз. атрада. Больш за 35 тыс. камсамольцаў-партызанаў і падпольшчыкаў Беларусі ўзнаг. ордэнамі і медалямі СССР, 28 прысвоена званне Героя Сав. Саюза.

Літ.: Советские партизаны, М., 1963, с. 515—557; Комсомол — нашей доблестной партии сын, Мн., 1960; Аблова Р. Это было в Белоруссии, М., 1957; Дзенісевіч А. Арлінае племя, Мн., 1970; Николаев Н. Минские молодогвардейцы, Мн., 1968; Короткевич А. Обелиск у дороги, Мн., 1971; Шмуглевский С. П. Рядовые подполья, Мн., 1971. *Р. М. Шавяла.* Мінск.

КАМСАМО́ЛЬСК-НА-АМУ́РЫ, горад краявога падпарадкавання ў Хабараўскім краі РСФСР, у ніжнім цячэнні Амура. Засн. ў 1932. Пабудаваны камсамольцамі, якія прыехалі сюды з усёй краіны, і названы ў іх гонар. Рачны порт і чыг. станцыя. 222 тыс. ж. (1971). З-ды: металургічны «Амурсталь», машынабудаўнічы, нафтаперапрацоўчы, жалезабетонных вырабаў, металаканструкцый. Дрэваапрацоўчая, лёгкая, харч. прамысловасць. Пед. і вячэрні політэхн. ін-ты; буд., політэхн., горна-металургічны тэхнікумы, мед. вучылішча. Драм. тэатр. Краязнаўчы музей.

Літ.: Лешкевич В. В. Комсомольск-на-Амуре, Л., 1969.

КАМУ́НА (да 1920 Ансельмава), вёска ў Ельскім с/с Ельскага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр саўгаса «Ельскі». За 2 *км* на З ад Ельска, 179 *км* ад Гомеля, на аўтамаб. дарозе, якая злучае вёску з Ельскам. 502 ж., гасп. 133 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, магазін.

КАМУ́НА, вёска ў Любанскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Беларускай ваеннай акругі. У 1940 узнаг. ордэнам Леніна. За 25 *км* на Пд ад Любані, 177 *км* ад Мінска, 50 *км* ад чыг. ст. Урэчча. 947 ж., дваро́ў 229 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, дзіцячыя яслі-сад, фельч.-ак. пункт, сталовая, магазін. Заснавана К. ў 1929 дэмабілізаванымі чырвонаармейцамі. У 1932 ператворана ў калгас імя Бел. ваеннай акругі. Заснаванне на Мар'інскіх балотах камуны, самаадданую працу камунараў, іх гераізм уславіў Я. Купала ў паэме «Над ракою Арэсай». Вёску двойчы (22.7.1941 і 2.6.1944) спалілі ням.-фаш. захопнікі. 2 помнікі: землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну, і сав. воінам, якія загінулі пры вызваленні К. ад ням.-фаш. захопнікаў. Іл. да арт. гл. на с. 316.





Камунары капаюць асушальны канал. 1928 (злева). Вёска Камуна. Вуліца Савецкая. 1971.

КАМУНА СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЯ, форма с.-г. вытворчага кааперавання, пры якой абагульваліся ўсе сродкі вытворчасці: зямля, жывёла, інвентар і г. д. У СССР у першыя гады Сав. улады былі пашыранай формай калгаснага буд-ва. Ствараліся пераважна на базе абшарніцкіх маёнткаў.

У К. с. аб'ядноўваліся вясковая беднота і парабкі. Асабістай дапаможнай гаспадаркі члены К. с. не мелі. Спажыванне і быт. абслугоўванне ажыццяўляліся за кошт грамадскай гаспадаркі. Аднак К. с. не адпавядалі ўзроўню развіцця прадукцыйных сіл, таму колькасць камун паступова меншала. На пач. 1921 у БССР было 132 камуны, у канцы 1925 — толькі 52, у 1933 яны складалі 0,5% усёй колькасці с.-г. кааператываў. У 30-я г. камуны перайшлі на статуты с.-г. арцелі. Гл. таксама *Калектывізацыя сельскай гаспадаркі*.

Літ.: Ленін У. І. Прамова на І Усерасійскім з'ездзе земельных аддзелаў, камітэтаў беднаты і камун 11 снежня 1918 г., Тв., т. 28 (Полн. собр. соч., т. 37); Мілавана ў В. А. Першыя крокі калгаснага руху ў Беларусі, Мн., 1958; Социально-экономические преобразования в Белорусской ССР за годы Советской власти, Мн., 1970.

М. Я. Стральцоў. Мінск.

КАМУНАЛЬНАЯ ГАСПАДАРКА, галіна народнай гаспадаркі ў СССР, якая аб'ядноўвае *жыллёвую гаспадарку*, цепласеткі, электратранспарт, санітарна-гігіенічныя службы, *гасцініцы*, рамонтна-буд. арг-цыі і з-ды па рамонце камунальнай тэхнікі, па вырабе нестандартызаванага абсталявання і аснасткі для жыллёва-камунальнай гаспадаркі, паркі, службы па ўпарадкаванні плошчаў, вуліц, мастоў і інш. Кіруюць К. г. мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных, якія маюць у гарадах аддзелы К. г. і ўпраўленні жыл. гаспадаркі, у раённых цэнтрах — камбінаты камунальных прадпрыемстваў. У вялікіх гарадах створаны галіновыя ўпраўленні (транспарту, водазабеспячэння, каналізацыі), якім падпарадкаваны камунальныя прадпрыемствы ці арг-цыі. Ёсць таксама прадпрыемствы і арганізацыі К. г. ведамаснага падпарадкавання.

У дарэвалюц. Беларусі жыллёвы фонд у гарадах і мястэчках на 80% складаўся з неўпарадкаваных драўляных будынкаў. Водаправод працаваў у 7 гарадах, каналізацыі не было. Пры Сав. уладзе К. г. планамерна развіваецца як адна з найважнейшых умоў павышэння дабрабыту працоўных. У БССР да 1941 агульная плошча жыл. фонду ў 3,5 раза перавышала ўзровень 1917; 13 гарадоў мелі водаправод, 4 — каналізацыю. У Айч. вайну ў гарадах, гар. і рабочых пасёлках знішчана каля 60% грамадскага жыл. фонду, разбураны водаправоды, электрастанцыі, сістэмы каналізацыі, трамвайныя дэпо. У пасляваенныя гады К. г. рэспублікі створана і развіваецца на новай тэхн. аснове. Яе развіццю садзейнічае вытворчасць спец. машын і абсталявання. У 1970 дзяржаўны жыллёвы фонд у гарадах, гар. і рабочых пасёлках склаў 27,8 млн. м². Працуюць 122 камунальныя водаправоды (агульная даўжыня 2900 км), у 28 гарадах — каналізацыйныя сістэмы. У тралейбусных парках 548 вагонаў, у трамвайных — 385 (1970). У гарадах, гар. і рабочых пасёлках БССР больш за 3 тыс. км дарог з цвёрдым пакрыццём, створаны і расшыраюцца паркавыя зоны, азеляняюцца вуліцы. У БССР у 1971—75 капіталаўкладанні на развіццё К. г. мясцовых Саветаў дэпутатаў працоўных павялічваюцца на 13% у параўнанні з 1966—70. У 9-й пяцігодцы плануецца пабудаваць новыя водаправодныя лініі даўж. 1100 км і каналізацыйныя — 395 км. Магутнасць водаправодаў павялічыцца амаль у 1,6 раза. Кантроль за дзейнасцю, планаванне і мат.-тэхн. забеспячэнне галіны К. г. ажыццяўляе Мін-ва камунальнай гаспадаркі БССР. Гл. таксама *Гарадабудаўніцтва, Добраўпарадкаванне населеных месцаў, Гарадскі транспарт*.

Літ.: Экономика Белоруссии в эпоху империализма. 1900—1917, Мн., 1963; Экономика Советской Белоруссии. 1917—1967, Мн., 1967.

У. Б. Труноў. Мінск.

КАМУНАР (назва прысвоена ў 1967), вёска ў Блюдніцкім с/с Буда-Кашалёўскага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр саўгаса «Камунар». За 21 км на ПдУ ад Буда-Кашалёва, 29 км ад Гомеля, 5 км ад чыг. ст. Уза, каля шашы Гомель — Магілёў (1,5 км). 1049 ж., гасп. 204 (1971). Сярэдняя школа-інтэрнат, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, швейная майстэрня, сталовая, 2 магазіны, гасцініца.

КАМУНАРЫ (засн. ў 1918), чыг. ст. на лініі Крычаў — Унеча, вёска ў Касцюковіцкім р-не Магілёўскай вобл. Падпарадкоўваецца Касцюковіцкаму гарсавету. За 3 км на У ад Касцюковіч, 149 км ад Магілёва. 1520 ж., двароў 373 (1971). Лясніцтва. Пач. школа, санаторная школа-інтэрнат, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, сталовая, магазін.

КАМУНІЗМ (ад лац. communis агульны, усеагульны), найвышэйшая грамадска-эканамічная фармацыя, якая гістарычна прыходзіць на змену *капіталізму* і грунтуецца на грамадскай уласнасці на сродкі вытворчасці, на таварыскім супрацоўніцтве і ўзаемадапамозе працоўных, свабодных ад эксплуатацыі, класавага і нац. прыгнечання. У сваім развіцці праходзіць дзве ступені (фазы), якія адрозніваюцца ўзроўнем эканам., паліт. і культурнай сталасці: *сацыялізм* і найвышэйшую — поўнае камуніст. грамадства. «Камунізм — гэта бясклясавы грамадскі лад з адзінай агульнанароднай уласнасцю на сродкі вытворчасці, поўнай сацыяльнай роўнасцю ўсіх членаў грамадства, дзе разам з усебаковым развіццём людзей вырастуць і прадукцыйныя сілы на аснове пастаяннага растучай навукі і тэхнікі, усе крыніцы грамадскага багацця пальюцца поўным патокам і ажыццёвіцца вялікі прынцып «ад кожнага — па здольнасцях, кожнаму — па патрэбнасцях». Камунізм — гэта высокаарганізаванае грамадства свабодных і свядомых працаўнікоў, у якім усталюецца грамадскае самакіраванне, праца на карысць грамадства стане для ўсіх першай жыццёвай патрэбнасцю, усвядомленай неабходнасцю, здольнасці кожнага будуць прымяняцца з найбольшай карысцю для народа» (Праграма Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Мн., 1961, с. 57). Тэорыя, якая раскрывае гістар. неабходнасць рэвалюц. змены капіталізму К. і шляхі пабудовы гэтага грамадства, створана К. Марксам, Ф. Энгельсам, У. І. Леніным (гл. *Навуковы камунізм*).

Сацыялізм і К. развіваюцца на агульнай эканамічнай аснове — грамадскай уласнасці на сродкі вытворчасці, якая выключае эксплуатацыю чалавека чалавекам. Пры сацыялізме на новай эканам., сац. і паліт. аснове існуюць класы, дзяржава, а таксама істотныя адрозненні паміж горадам і вёскай, разумовай і фіз. працай. Грамадская ўласнасць на сродкі вытворчасці мае дзве формы — дзяржаўную і калгасна-кааператыўную. Узровень эканам. развіцця дае магчымасць ажыццяўляць прынцып «ад кожнага — па здольнасцях, кожнаму — па працы». Рэгулятарам размеркавання працы і прадуктаў выступае дзяржава. Ажыццяўляецца ўсеагульнасць працы. Бурна расце культура народа, яго адукацыя, фарміруецца сацыяліст. свядомасць, ідэалогія, маральна-паліт. адзінства грамадства, развіваецца сацыяліст. дэмакратыя, узрастае працоўная і паліт. актыўнасць нар. мас. Кіруючая роля ў буд-ве сацыялізма належыць Камуніст. партыі. К. прадугледжвае гіганцкае развіццё прадукцыйных сіл, зліццё дзвюх формаў уласнасці ў адну — агульнанародную, ператварэнне працы ў першую жыццёвую патрэбу чалавека, у прывычку здаровага арганізма; у сац. галіне — пераадоленне істотных адрозненняў паміж горадам і вёскай, разумовай і фіз. працай, фарміраванне агульнанароднага бясклясавага грамадства. Сацыяліст. дзяржава адмірае, яе функцыі перадаюцца грамадскім арг-цыям, зацвярджаецца непалітычная дэмакратыя. Асн. рэгулятарам адносін паміж асобай і грамадствам, паміж членамі калектыву становяцца прынцыпы камуніст. маралі. Фарміруецца новы тып чалавека, яго духоўны свет. Сацыяліст. свядомасць перарастае ў камуністычную. На аснове развіцця культуры камунізма забяспечваецца багацце духоўных даброт. Узятыя ў адзінстве эканам., сац. і духоўныя асновы К. даваляць перайсці да прынцыпу «ад кожнага — па здольнасцях, кожнаму — па патрэбнасцях». Упершыню ў гісторыі людзі атрымліваюць у асабістае карыстанне ўсё неабходнае для задавальнення разумных патрэб усебакова развітага чалавека. СССР — першая ў гісторыі чалавецтва краіна, якая пракладвае шлях да К. *Сацыялістычная рэвалюцыя* на чале з рабочым класам, устанаўленне дыктатуры пралетарыяту, кіруючая і арганізуючая сіла Камуніст. партыі стварылі ўмовы для сацыяліст. буд-ва. Ажыццяўленне палітыкі індустрыялізацыі, калектывізацыі, культурнай рэвалюцыі, фарміраванне сацыяліст. нацый, змяненне сац. структуры сав. грамадства, адзінства інтарэсаў народа, партыі і дзяржавы азначалі заканчэнне пераходу ад капіталізму да сацыялізма. У СССР пабудавана развітае сацыяліст. грамадства, дасягнуты высокі ўзровень прадукцыйных сіл, сацыяліст. грамадскіх адносін, культуры і свядомасці нар. мас. Сацыяльная структура грамадства цалкам вызвалена ад усялякіх рэшткаў эксплуататарскіх класаў і вызначаецца растучым сац.-паліт. і ідэйным адзінствам рабочага класа, калгаснага сялянства і інтэлігенцыі, паступовым сціраннем адрозненняў паміж імі. Маналітна згуртаваныя класы, нацыі, групы і слаі сав. грамадства ўтвараюць новую гістар. супольнасць — *савецкі народ*. У паліт. галіне гэтаму этапу адпавядае перарастанне дзяржавы дыктатуры пралетарыяту ў *агульнанародную дзяржаву*. Дэмакратыя ўсебакова развіваецца, становіцца агульнанароднай. Навук. ідэалогія *марксізма-ленінізма* — аснова духоўнага жыцця грамадства і росту свядомасці працоўных. Своеасаблівасць гэтага этапа ў «пераходзе ад сацыялізма, які канчаткова перамог і ўмацаваўся, да поўнага камунізма» (Ленін У. І. Тв., т. 22, с. 132). На ўзроўні развітага сацыяліст. грамадства сав. народ, выкарыстоўваючы дасягненні навук.-тэхн. прагрэсу, стварае *матэрыяльна-тэхнічную базу камунізма*. Адначасова пераўтвараюцца грамадскія адносіны, ствараюцца перадумовы для пераадолення істотных адрозненняў паміж горадам і вёскай, разумовай і фіз. працай, для сцірання класавых і ўнутрыкласавых адрозненняў, складвання аднароднага бясклясавага грамадства, фарміравання яго духоўных і сац. асноў. Фарміруецца новы тып чалавека і працаўніка. Звужэнне эканам. базы імперыялізму і ўмацаванне матэрыяльна-тэхн. базы *сусветнай сістэмы сацыялізма*, узрастанне прыцягальнай сілы камуніст. ідэалу для шырокіх мас працоўных свету абумоўліваюць спрыяльныя міжнар. ўмовы барацьбы за К. «Імперыялізм бяссільны вярнуць страчаную ім гістарычную ініцыятыву, павярнуць назад развіццё сучаснага свету. Магістральны шлях развіцця чалавецтва вызначаюць сусветная сацыялістычная сістэма, міжнародны рабочы клас, усе рэвалюцыйныя сілы» (Дакументы міжнароднай Нарады камуністычных і рабочых партый. Масква, 5—17 чэрвеня 1969 года, Мн., 1969, с. 6—7). XXIV з'езд КПСС сфармуляваў і канкрэтызаваў задачы будаўніцтва К. ў СССР, выпрацаваў навукова абгрунтаваны паліт. курс, які нацэльвае партыю і народ на вырашэнне найважнейшых пытанняў палітыкі, эканомікі, ідэалагічнай і арганізатарскай дзейнасці. У галіне эканомікі — забяспечыць

далейшы значны рост прамысловасці, высокія ўстойлівыя тэмпы развіцця с. гасп., дамагчыся істотнага ўздыму ўзроўню жыцця народа, больш поўнага задавальнення яго матэрыяльных і культурных патрэб. У галіне сац. палітыкі — накіраваць намаганні на ўмацаванне адзінства сав. грамадства на аснове збліжэння класаў і сац. груп, усіх нацый і народнасцей, на развіццё сав. дэмакратыі, якая залучае ўсё больш шырокія масы да дзярж. кіравання, на выраўноўванне культурна-бытавых умоў жыцця сельскіх і гарадскіх працоўных. З'езд адзначыў, што буд-ва К. арганічна звязана з фарміраваннем новага чалавека, з выхаваннем і навучаннем усебакова развітых і падрыхтаваных людзей. Актыўная роля ў стварэнні духоўных перадумоў К. належыць марксісцка-ленінскаму светапогляду, камуніст. ідэалогіі, л-ры, мастацтву, навуцы. Рабочы клас, працоўнае чалавецтва, яго камуніст. авангард гераічнай барацьбою, самаадданай працай сцвердзілі час, калі сусветная гісторыя не можа развівацца па-за сацыялізмам і К., насуперак ім. Практычны вопыт будаўніцтва новага грамадства ў СССР і краінах сацыялістычнай садружнасці — найвялікшая сіла сучаснасці, магутная зброя ў барацьбе супраць беспадстаўных канцэпцый антыкамунізму, рэвізіянісцкіх мадэляў сацыялізма, ідэалогій правага і «левага» апартунізму. К.— інтэрнацыянальнае вучэнне, яго ідэі не ведаюць геагр. межаў і перашкод.

Літ.: Маркс К. и Энгельс Ф. Немецкая идеология, Соч., т. 3; Іх жа. Маніфест Камуністычнай партыі, Мн., 1968; Маркс К. Да крытыкі палітычнай эканоміі, Мн., 1952, с. 5—10; яго ж. Грамадзянская вайна ў Францыі, Мн., 1955; яго ж. Капітал, т. 1, Мн., 1952; яго ж. Крытыка Гоцкай праграмы, Мн., 1968; Энгельс Ф. Принципы коммунизма, Маркс К. и Энгельс Ф. Соч., т. 4; яго ж. Людвіг Феербах і канец класічнай нямецкай філасофіі, Мн., 1953; яго ж. Паходжанне сям'і, прыватнай уласнасці і дзяржавы, Маркс К. і Энгельс Ф. Выбраныя творы, т. 2, Мн., 1952; Ленін У. І. Тв. [гл. Даведачны т., ч. 1 (Справочный т. к Полн. собр. соч., ч. 1)]; Праграма Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Мн., 1961; Материалы XXIII съезда КПСС, М., 1966; Матэрыялы XXIV з'езда КПСС, Мн., 1971; Документы міжнароднай Нарады камуністычных і рабочых партый. Москва, 5—17 чэрвеня 1969 года, Мн., 1969; Брежнев Л. И. Ленинским курсом. Речи и статьи, т. 1—2, М., 1970; От социализма к коммунизму, Мн., 1963. *К. П. Буслай.* Мінск.

КАМУНІКА́ЦЫІ (лац. communicatio сувязь, паведамленне), шляхі зносін, лініі транспарту, сувязі, сетка падземных інжынерна-тэхн. збудаванняў (трубаправоды цепла- і газіфікацыі, водаправод і г. д.).

«КАМУНІСТ», грамадска-палітычная газета, орган Бабруйскага раённага і гар. к-таў КПБ, раённага і гар. Саветаў дэп. працоўных. Выходзіць у Бабруйску з 28.11.1918. Да 1925 выдавалася на рус. мове. Разлічана на шырокія колы чытачоў. Асвятляе пытанні грамадска-паліт., эканам. і культ. жыцця раёна і горада, поспехі працоўных у камуніст. буд-ве.

Спачатку наз. «Известия Бобруйского революционного комитета (Ревкома)»; з лют. 1919 — «Коммунист», падзагаловак — весці Бабруйскага павятовага выканаўчага камітэта Савета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў; з чэрв. 1919 — орган Бабруйскага павятовага выканкома Савета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэп. З 1924 выдавалася як сялянская газета, орган Бабруйскага акругкома КП(б)Б і акрвыканкома. У 1932 орган Бабруйскага райкома КП(б)Б, райвыканкома і райпрафсавета, затым орган райкома і гаркома КП(б)Б. У Айч. вайну пераемніцай «К.» стала газ. «Бобруйский партизан», якая выдавалася падпольна ў 1942—43. З 3.7.1944 «К.» выходзіць як гарадская газета. З утварэннем Бабруйскай вобл. на базе газ. «К.» з кастр. 1944 да студз. 1954 выходзіла бабруйская абл. газ. «Савецкая Радзіма». У 1954—56, пасля скасавання Бабруйскай вобл., «К.» зноў выходзіў як орган гаркома КП(б)Б і гарвыканкома, з 1956 — аб'яднаная гарадская і раённая газета. У 1925—30 адказным сакратаром рэдакцыі, рэдактарам «К.» працаваў бел. пісьменнік М. Лынькоў. У 1928—31 газета выдавала штомесячны літ. дадатак «Вясна» (з № 6 за 1931 — «Ударнік»). Рэдактар М. П. Валатковіч (з 1963). *М. П. Валатковіч.* Бабруйск.

КАМУНІСТЫЧНАЕ ВЫХАВА́ННЕ, фарміраванне ўсебакова і гарманічна развітых, высокасвядомых людзей, свабодных ад перажыткаў мінулага, актыўных будаўнікоў камуністычнага грамадства; адзін з найб. важных бакоў пераўтварэння грамадства пры пераходзе да камунізма. Аснова К. в.— засваенне марксізма-ленінізма, сцвярджэнне камуніст. ідэалогіі і маралі. Маральна-паліт. якасці сав. людзей фарміруюцца пад уздзеяннем сацыяліст. ўкладу жыцця, у працэсе мэтанакіраванай ідэйна-выхаваўчай работы Камуніст. партыі сярод працоўных. Асн. задачы і метады К. в. распрацавалі класікі марксізма-ленінізма. Яны раскрылі сац. прыроду выхавання і яго класава-гістарычны характар, звязалі выхаванне людзей з перабудовай грамадскіх адносін, з актыўнай роляю людзей у гэтай перабудове. У працэсе грамадска-гістар. практыкі, змен сац. адносін адбываецца самавыхаванне чалавека, фарміраванне яго рэальнай грамадскай сутнасці, а таксама свядомасці, псіхікі, маральных і эстэт. пачуццяў. Стварэнне сацыяліст. грамадскіх адносін — аснова К. в. працоўных. Найб. важныя задачы К. в. сфармуляваны ў Праграме КПСС. Ва ўмовах сацыялізма і буд-ва камуніст. грамадства першаступеннае значэнне набывае фарміраванне ў працоўных навук. светапогляду. У цэнтр выхаваўчай работы партыя ставіць выхаванне новых, камуніст. адносін да працы і сацыяліст. уласнасці. Праграма КПСС упершыню сфармулявала *маральны кодэкс будаўніка камунізма*, які з'яўляецца асновай *маральнага выхавання* асобы сацыяліст. грамадства. К. в. прадугледжвае таксама выхаванне ў сав. грамадзян пралет. інтэрнацыяналізму (гл. *Інтэрнацыянальнае выхаванне*), сацыяліст. патрыятызму, пачуцця гордасці за сваю Радзіму, за свой народ, выхаванне адданасці Айчыне (гл. *Ваенна-патрыятычнае выхаванне*). У перыяд пераходу да камунізма ўзрастаюць магчымасці выхавання новага чалавека, які гарманічна спалучае ў сабе духоўнае багацце, маральную чысціню і фізічную дасканаласць. Новае аблічча сав. чалавека, яго камуніст. мараль і светапогляд сцвярджаюцца ў пастаяннай і прынцыповай барацьбе з перажыткамі мінулага ў свядомасці і паводзінах людзей. Галоўнае ў ідэалагічнай рабоце партыі — прапаганда ідэй марксізма-ленінізма, непрымірымая наступальная барацьба супраць бурж. і рэвізіянісцкай ідэалогіі. XXIV з'езд КПСС (1971) паставіў задачу зрабіць больш актыўнай і мэтанакіраванай прапаганду камуніст. ідэалаў, ад паспяховага вырашэння якой у значнай ступені залежыць К. в. працоўных.

К. в. дзяцей пачынаецца ў раннім дзяцінстве ў сям'і, мэтанакіравана ажыццяўляецца ў дзіцячых дашкольных установах. Галоўная роля ў К. в. дзяцей і моладзі належыць сав. школе. Змест, метады і арганізацыйныя формы навучання ў сав. школе садзейнічаюць фарміраванню светапогляду і маральнага аблічча вучняў. Важнае месца ў К. в. займаюць дзіцячыя і юнацкія камуніст. арг-цыі, пазашкольныя ўстановы. Сав. педагогіка вызначыла асн. прынцыпы К. в. маладога пакалення: камуніст. мэтанакіраванасць, сувязь выхавання з жыццём, выхаванне ў працы, у калектыве, спалучэнне кіраўніцтва працэсам выхавання з шырокай самадзейнасцю і актыўнасцю вучняў, павага да асобы і высокая патрабавальнасць да яе. К. в. сав. людзей ажыццяўляюць парт., прафс., камсамольскія і інш. грамадскія арг-цыі, ВНУ і сярэднія спец. навуч. ўстановы, калектывы заводаў, фабрык, калгасаў, саўгасаў, устаноў. Магутны сродак К. в.— мастацкая л-ра, мастацтва, кіно, газеты, часопісы, тэлебачанне, радыё, інфармацыйныя агенцтвы. Па мэтах, змесце і метадах К. в. карэнным чынам адрозніваецца ад выхавання ў капіталіст. грамадстве. Буржуазнае выхаванне служыць інтарэсам пануючых класаў і аўплывае сродкам занявольвання працоўных. Гл. таксама *Выхаванне, Атэістычнае выхаванне, Разумовае выхаванне, Сямейнае выхаванне, Фізічнае выхаванне, Эстэтычнае выхаванне, Дашкольнае выхаванне, Маральнае выхаванне, Працоўнае выхаванне.*

Літ.: Маркс К. и Энгельс Ф. О воспитании и образовании, М., 1957; Ленин В. И. О воспитании и образовании, 2 изд., М., 1970; Праграма Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Мн., 1961; Брэжнеў Л. І. Справаздачны даклад Цэнтральнага Камітэта КПСС XXIV з'езду Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Мн., 1971; Калинин М. И. О воспитании и обучении. Избр. статьи и речи, М., 1957; Крупская Н. К. О коммунистическом воспитании, М., 1956; Макаренко А. С. О коммунистическом воспитании, 2 изд., М., 1956; Сухомлинский В. А. Формирование коммунистических убеждений молодого поколения, М., 1961; Смирнов Г. Л. Советский человек. Формирование социалистического типа личности, М., 1971. *М. Г. Агурцоў.* Мінск.

«КАМУНІСТЫЧНАЕ ВЫХАВА́ННЕ», педагагічны, палітыка-асветны часопіс, орган Народнага камісарыята асветы і ЦК прафсаюза пачатковых і сярэдніх школ БССР. Выходзіў з чэрв. 1924 да 1936 у Мінску, змяшчаў матэрыялы на бел. і рус. мовах. Да снеж. 1929 (укл.) наз. «Асвета», са студз. 1930 — «К. в.». Выйшла: 3 нумары ў 1924, 7 у 1925, у 1926—28 па 8 нумароў, у 1929—32 па 12, у 1933—34 па 8, у 1935 — 10 нумароў, 2 у 1936. Асвятляў пытанні ажыццяўлення ўсеагульнага навучання ў БССР, методыкі і арганізацыі навуч. працэсу ў школе, змяшчаў матэрыялы аб камуніст. выхаванні новага пакалення, крытыка-бібліяграфічныя агляды кніг на пед. тэмы, на школьныя падручнікі і дапаможнікі. Быў разлічаны на настаўнікаў, работнікаў асветы і на шырокае кола чытачоў.

КАМУНІСТЫЧНАЯ ПА́РТЫЯ АЛБА́НІІ, з 1948 наз. *Албанская партыя працы.*

КАМУНІСТЫЧНАЯ ПА́РТЫЯ АРГЕНЦІ́НЫ (КПА), засн. 6.1.1918 ва ўмовах рэвалюц. ўздыму і пад уплывам Вял. Кастр. сацыяліст. рэв. на з'ездзе прадстаўнікоў левага крыла Сацыяліст. партыі Аргенціны; да 1920 называлася Інтэрнац. сацыяліст. партыя Аргенціны (ІСП). Паводле рашэння II з'езду партыі (крас. 1919) уступіла ў Камінтэрн.

З першых дзён існавання КПА адстойвае прынцыпы пралет. інтэрнацыяналізму ў міжнар. рабочым руху, паслядоўна выступае за інтарэсы рабочага класа, сялянства, усяго народа. У 1922 па ініцыятыве КПА створаны першы ў краіне адзіны прафсаюзны цэнтр. У 1930—45 працавала ў падполлі. Пасля 2-й сусв. вайны ва ўмовах уздыму дэмакр. руху КПА ўмацніла работу па мабілізацыі мас на барацьбу за дэмакр. свабоды, на абарону нац. эканомікі ад амер. манаполій. У 50-я г. КПА разгарнула барацьбу за стварэнне шырокага нац.-дэмакр. фронту ў краіне праз аб'яднанне ўсіх сіл, што выступаюць за нац. незалежнасць і супраць рэакц. унутранай палітыкі правячых колаў краіны. Гэтая барацьба павялічыла ўплыў КПА ў масах. У 1959 па ініцыятыве КПА створаны прафс. цэнтр — Рух за адзінства і кардынацыю прафс. дзейнасці. Напалоханы ростам аўтарытэту кампартыі ўрад у 1959 забараніў яе. КПА перайшла ў падполле. У 1963 XII з'езд КПА прыняў новую праграму і статут.

Пасля рэакц. ваен. перавароту 27.6.1966 КПА выступіла з ініцыятывай стварыць шырокую дэмакр. кааліцыю ўсіх прагрэс. сіл, кіруючая роля ў якой павінна належаць пралетарыяту. 25—29.3.1969 адбыўся XIII з'езд КПА, які паставіў задачу аб'яднаць усе антыдыктатарскія сілы на аснове праграмы-мінімум — праграмы нац. згоды, каб стварыць нац.-дэмакр. фронт, скінуць ваен. дыктатуру, утварыць дэмакр. ўрад і даць магчымасць самому народу вызначыць будучы эканам. і сац. лад краіны. Барацьба за ажыццяўленне праграмы-мінімум непарыўна звязана з барацьбой за ажыццяўленне праграмы-максімум — праграмы дэмакр. аграрнай і антыімперыял. рэвалюцыі з арыентацыяй на сацыялізм. Ва ўмовах падполля КПА ажыццявіла выданне 45-томнага збору твораў У. І. Леніна. КПА ўдзельнічала ў рабоце маск. Нарад камуніст. і рабочых партый 1957, 1960 і 1969 і падпісала прынятыя на іх дакументы. Будуецца паводле прынцыпаў дэмакр. цэнтралізму. Больш за 100 тыс. чл. (1970). Ген. сакратар ЦК КПА Хераніма Арнеда Альварэс. Друкаваныя органы — штотыднёвая газ. «Nuestra Palabra» («Наша слова») і штомесячны тэарэт. час. «Nueva Era» («Новая эра»).

Літ.: Кодовильля В. Избр. статьи и речи, пер. с исп., М., 1970. *Л. Я. Машазерская.* Масква.

КАМУНІСТЫЧНАЯ ПА́РТЫЯ БАЛГА́РЫІ, гл. *Балгарская камуністычная партыя.*

КАМУНІСТЫЧНАЯ ПА́РТЫЯ БЕЛАРУСІ (КПБ), састаўная частка *Камуністычнай партыі Савецкага Саюза*, кіруючай і накіроўваючай сілы сав. народа ў барацьбе за камунізм. КПБ абвешчана і арганізацыйна афармлена ў канцы снеж. 1918. Яна аб'яднала бальшавіцкія арг-цыі, якія сфарміраваліся на Беларусі ў працэсе рэвалюц. руху пралетарыяту і ў маналітным страі бальшавіцкай партыі пад кіраўніцтвам У. І. Леніна прайшлі гераічны шлях барацьбы за звяржэнне царызму і капіталізму, за перамогу ўлады Саветаў у нашай краіне. КПБ заснавана на ленінскіх тэарэт., ідэалагічных і арганіз. прынцыпах і з'яўляецца найвышэйшай формай грамадска-паліт. арг-цыі.

Першыя сацыял-дэмакратычныя гуртки і групы. Узнікненне арганізацый РСДРП на Беларусі. Першыя на Беларусі гуртки і групы марксісцкага кірунку ўзніклі ў 80 — пач. 90-х

г. 19 ст. ў Мінску, Віцебску, Гродне, Гомелі, Навагрудку і інш. (гл. *Мінскія рабочыя гурткі, Гродзенскі рэвалюцыйны гурток* 1887—94, *Гомельскі рабочы гурток самаадукацыі* 1893—95). Па прыкладзе створанага ў 1895 Леніным *Пецярбургскага «Саюза барацьбы за вызваленне рабочага класа»* ў 2-й пал. 90-х г. сацыял-дэмакр. арг-цыі ўтварыліся ў Гомелі, Мінску, Віцебску, Гродне, Бабруйску, Магілёве, Смаргоні, Брэсце, Пінску і інш. Ад прапаганды марксізма ў гуртках яны перайшлі да масавай паліт. агітацыі сярод рабочых, узначальвалі іх выступленні, злучаючы навуковы сацыялізм з рабочым рухам. Развіццю сацыял-дэмакр. руху на Беларусі спрыяў *Першы з'езд РСДРП*, які адбыўся ў Мінску 1—3(13—15).3.1898 і абвясціў пра ўтварэнне РСДРП. Вялікую ролю ў кансалідацыі рэвалюц. сацыял-дэмакратаў Беларусі адыграла ленінская газ. «Искра», якая была цэнтрам аб'яднання сіл партыі, збірання і выхавання парт. кадраў. Распаўсюджванню «Искры» на Беларусі папярэднічала дзейнасць *агентаў «Искры»* І. В. Бабушкіна, І. Х. Лалаянца і інш. З 1901 у Мінску і Гомелі дзейнічалі іскраўскія групы, прыхільнікі «Искры» былі ў Бабруйску, Барысаве, Брэсце, Віцебску, Горках, Гродне, Копысі, Магілёве, Мазыры, Оршы, Пінску, Полацку, Смаргоні, Шклове і інш. Пасля II з'езду РСДРП (1903), які стварыў у Расіі партыю новага тыпу, на Беларусі на базе іскраўскіх груп і з прыхільнікаў «Искры» ў абставінах вострай ідэйнай барацьбы з бундаўцамі і інш. апартуністамі пачалі складвацца арг-цыі РСДРП: Аршанская, Ашмянская, Бабруйская, Барысаўская, Брэсцкая, Віцебская, Гомельская, Гродзенская, Даўгінаўская, Капыльская, Копыская, Лідская, Магілёўская, Мазырская, Мінская, Пінская, Полацкая, Смаргонская (гл. адпаведныя артыкулы). Вядную ролю ў стварэнні і наладжванні работы арг-цый РСДРП на Беларусі адыгралі прадстаўнікі Замежнага бальшавіцкага цэнтра М. М. Літвінаў, У. І. Неўскі, Дз. С. Пасталоўскі, М. К. Уладзіміраў; бальшавікі Я. Я. Беленькі, Ф. В. Сімончык, Р. Л. Шклоўскі і інш. У пач. 1904 ЦК РСДРП па ініцыятыве Леніна стварыў на Беларусі 2 парт. цэнтры: *Палескі камітэт РСДРП(б)* (студз. 1904) і *Паўночна-Заходні камітэт РСДРП* (сак. 1904), якія аб'ядноўвалі і накіроўвалі парт. арг-цыі сваіх раёнаў і падпарадкоўваліся непасрэдна ЦК. К-ты і арг-цыі РСДРП на Беларусі трымалі сувязь з парт. арг-цыямі многіх гарадоў Расіі, з бальшавіцкім цэнтрам за мяжой. У Мінску, Гомелі, Гродне дзейнічалі перадатачныя пункты, праз якія нелегальная л-ра з-за мяжы накіроўвалася ў Маскву, Пецярбург, Смаленск і інш. (пра распаўсюджванне марксізма на Беларусі гл. таксама ў арт. *Марксізм-ленінізм*).

Сацыял-дэмакратычныя арганізацыі Беларусі ў перыяд першай рускай рэвалюцыі. У рэвалюцыю 1905—07 у Расіі бальшавікі Беларусі разам з усёй партыяй прайшлі вялікую паліт. школу, набылі вопыт арганіз. работы. Яны ўзначальвалі рэвалюц. выступленні рабочых, салдатаў і сялян, якія з'яўляліся састаўной ч. барацьбы працоўных усёй Расіі супраць самадзяржаўя. Палескі і Паўн.-Зах. к-ты выказаліся за скліканне III з'езду РСДРП і прызналі абавязковымі для сябе яго рашэнні. Дэлегаты парт. арг-цый Беларусі Дз. С. Пасталоўскі, М. К. Уладзіміраў, Р. Л. Шклоўскі галасавалі на гэтым з'ездзе за ленінскія рэзалюцыі. Для кіраўніцтва рэвалюц. рухам салдатаў былі створаны ваенна-рэвалюц. арг-цыі РСДРП.

Гл. Бабруйская ваенна-рэвалюцыйная арганізацыя РСДРП, Брэсцкая ваенна-рэвалюцыйная арганізацыя РСДРП, Ваенна-рэвалюцыйная арганізацыя пры Абласным саюзе РСДРП Літвы і Беларусі, Ваенна-рэвалюцыйная арганізацыя пры Мінскай групе РСДРП, Віцебская ваенна-рэвалюцыйная арганізацыя РСДРП, Гродзенская ваенна-рэвалюцыйная арганізацыя РСДРП.

Для ўмацавання саюзу рабочага класа і сялянства, залучэння сялян да рэвалюц. барацьбы пры арг-цыях РСДРП былі створаны сялянскія арг-цыі (гл. *Сялянскія арганізацыі пры РСДРП, Мінская акруговая сялянская арганізацыя пры РСДРП*); для кіраўніцтва мясцовымі парт. групамі і паліт. работы на вёсцы — *акруговыя арганізацыі РСДРП* (гл. *Віленская акруговая арганізацыя РСДРП, Смаргонская акруговая арганізацыя РСДРП*). У рэв. 1905—07 пад кіраўніцтвам бальшавікоў адбыліся *Бабруйскага батальёна пабстанне, Баранавіцкае выступленне рабочых і салдат 1905, Брэсцкія выступленні салдат 1905 і 1906, Гомельскае выступленне рабочых 1905, Навагрудскія выступленні сялян 1905 і 1906, Пінскае выступленне рабочых 1905* і інш. За час рэв. 1905—07 парт. арг-цыі Беларусі значна выраслі і ў 1906 налічвалі каля 4,5 тыс. чал.

Пытанні кіраўніцтва рэвалюц. рухам, тактыкі і парт. буд-ва ў рэвалюцыю 1905—07 арг-цыі РСДРП Беларусі разглядалі на з'ездах і канфер., якія праходзілі ў жорсткай барацьбе паміж бальшавікамі і меншавікамі. Гл. *Першы з'езд арганізацый РСДРП Палескага раёна* (май 1905), *З'езд партыйных груп Паўночна-Заходняга камітэта РСДРП* (першы, жн. 1905), *З'езд Паўночна-Заходняга саюза РСДРП* (другі, ліст. 1905), *З'езд Паўночна-Заходняга саюза РСДРП* (трэці, май — чэрв. 1906), *Першая канферэнцыя Віленскай акруговай арганізацыі РСДРП* (студз. 1906), *Другая канферэнцыя Смаргонскай акруговай арганізацыі РСДРП* (жн. 1906), *Трэцяя канферэнцыя Віленскай акруговай арганізацыі РСДРП* (чэрв. 1906), *Першая канферэнцыя Абласнога саюза РСДРП Літвы і Беларусі* (кастр. 1906), *Другая канферэнцыя Абласнога саюза РСДРП Літвы і Беларусі* (люты 1907), *Першая абласная канферэнцыя арганізацый РСДРП Паўночна-Заходняга краю* (жн. 1905), *Канферэнцыя прапагандыстаў арганізацый РСДРП Паўночна-Заходняга краю* (вер.— кастр. 1905).

Сацыял-дэмакратычны рух на Беларусі ў гады рэакцыі і новага рэвалюцыйнага ўздыму. Пасля паражэння рэв. 1905—07 бальшавікі Беларусі, нягледзячы на цяжкія страты і жорсткія рэпрэсіі, прытрымліваліся ленінскай тактыкі выкарыстання ўсіх формаў легальнай і нелегальнай работы, каб усталяваць сувязі з масамі, змагаліся за аднаўленне разгромленых і ўмацаванне аслабленых парт. арг-цый. Амаль увесь перыяд рэакцыі нелегальна дзейнічалі парт. арг-цыі ў Мінску, Віцебску, Оршы, Гродне, Брэсце. Яны актыўна падтрымлівалі барацьбу Леніна супраць ліквідатараў, адзавістаў, рэвізіяністаў. У 1908 адбылася нарада бальшавікоў Вільні, Гродна, Брэста і Вілейкі, якая абмеркавала парадак дня V Агульнарас. канфер. РСДРП, што мелася адбыцца, і вызначыла кірунак дзейнасці мясц. парт. арг-цый у перыяд сталыпінскай рэакцыі. У гады новага рэвалюц. ўздыму (1910—14) бальшавікі Беларусі кіравалі выступленнямі рабочых, сялян, рыхтавалі іх да новых класавых бітваў; летам 1911, паводле ўказання Леніна, уключыліся ў падрыхтоўку VI Агульнарас. канфер. РСДРП. У 1912 Палескі к-т РСДРП адкінуў намаганні Троцкага ўвайсці ў апартуністычны блок, ухваліў рашэнні VI (Пражскай) Агульнарас. канфер. РСДРП (1912) і прызнаў выбраны ёю ЦК. На такіх жа пазіцыях сталі Мінская, Дзвінская і некат. інш. парт. арг-цыі Беларусі. Па закліку бальшавікоў рабочыя і сяляне Беларусі падтрымлівалі газ. «Правда», у Гомелі, Мінску, Магілёве, Брэсце, Добрушы, Капылі існавалі праўдзісцкія групы і гурткі, якія мелі пастаянную сувязь з бальшавіцкай фракцыяй 4-й Дзяржаўнай думы. Парт. работу на Беларусі ў гэты час вялі У. М. Залежскі, М. М. Галіцкі, А. Я. Бадаеў, М. М. Хатаевіч і інш.

Бальшавікі Беларусі ў перыяд першай сусветнай вайны і Лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі. Нягледзячы на цяжкія рэпрэсіі царскага ўрада супраць бальшавікоў, партыя прадаўжала барацьбу, скарыстоўвала для гэтага любую магчымасць. У складаных умовах прыфрантавой палосы змагаліся бальшавікі Беларусі. Дзейнічалі Палескі камітэт РСДРП, бальшавіцкія групы ў Мінску. У 1-ю сусветную вайну, у сувязі з размяшчэннем Зах. фронту, на тэрыторыі Беларусі апынуліся многія бальшавікі з інш. парт. арг-цый краіны, сярод іх: М. В. Фрунзе, А. Ф. Мяснікоў, В. Г. Кнорын, І. Е. Любімаў, Я. Ф. Пярно, В. В. Фамін, І. Я. Алібегаў, І. К. Ксенафонтаў, якія ўзначальвалі тут рэвалюц. рух. Кіруючыся марксісцка-ленінскай тэорыяй на пытаннях вайны, міру і рэвалюцыі, бальшавікі Беларусі змагаліся з абаронцамі-меншавікамі, эсэрамі, бундаўцамі, праводзілі агіт. работу сярод рабочых, сялян і салдатаў Зах. фронту, растлумачвалі ленінскія тактычныя лозунгі аб ператварэнні вайны імперыял. у вайну грамадзянскую, паражэнні «свайго» бурж. ўрада, аб стварэнні новага, свабоднага ад апартуніз му, 3-га Інтэрнацыянала. У 1-ю сусв. вайну адбыліся шматлікія выступленні рабочых і сялян Беларусі, салдатаў Зах. фронту. Буйной рэвалюц. падзеяй было *Гомельскага размеркавальнага пункта пабстанне 1916*. Бальшавікі Беларусі зрабілі вял. ўклад у перамогу Лют. бурж.-дэмакр. рэвалюцыі 1917. У Віцебску, Магілёве, Мінску і інш. гарадах адбыліся забастоўкі рабочых і выступленні салдатаў; сялянскі рух прыняў асабліва вострыя формы ў Барысаўскім, Ігуменскім, Мазырскім, Мінскім, Слуцкім пав.









У в е р с е: бальшавіцкая ячэйка 32-га тылавога эвакуацыйнага пункта ў Мінску. У 1-м радзе злева направа: В. Г. Кнорын, М. І. Крывашэін, Я. Ф. Пярно. Канец 1916 ці пач. 1917 (злева); беларускі камуністычны атрад перад адпраўкай на польскі фронт. Петраград. 1919. У н і з е: адпраўка харчатрадаў у вёску. Віцебск. 1918 (злева); партыйны сход 1-й Коннай арміі на Заходнім фронце. 1920.

Бальшавікі Беларусі ў перыяд падрыхтоўкі і перамогі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. З выхадам бальшавіцкай партыі з падполля пасля перамогі Лют. рэвалюцыі парт. арг-цыі Беларусі наладзілі цесную сувязь з ЦК партыі, з Леніным. Бальшавікі Мінска і Віцебска ў крас. 1917 паслалі сваіх прадстаўнікоў для сувязі з ЦК і для ўдзелу ў VII (Крас.) Усерас. канфер. РСДРП(б). Пад уплывам Красавіцкіх тэзісаў У. І. Леніна, рашэнняў Крас. канфер. бальшавікі Беларусі пачалі выходзіць з «аб'яднанак», у якія яны памылкова ўвайшлі пасля Лют. рэв., ствараць самастойныя арг-цыі. Выкрываючы палітыку эсэраў, меншавікоў, бундаўцаў, бел. бурж. нацыяналістаў, яны ўмацоўвалі свае пазіцыі ў Саветах, рабочых, сялянскіх і салдацкіх арг-цыях, змагаліся за перарастанне бурж.-дэмакр. рэвалюцыі ў рэвалюцыю сацыялістычную. Вял. ролю ў паліт. выхаванні мас адыграла газ. *«Звязда»* — орган Мінскага к-та РСДРП(б). Кіруючыся рашэннямі VI з'езду РСДРП(б) [26.7(8.8)—3(16).8.1917], які нацэліў партыю на ўзбр. паўстанне, бальшавікі Беларусі ўзмацнілі работу па завалванні мас, згуртаванні іх вакол партыі, умацаванні саюзу рабочага класа і бядняцкага сялянства як гал. з умоў перамогі сацыяліст. рэвалюцыі. Важнай вяхой на шляху стварэння Кампартыі Беларусі з'явілася *Першая Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РСДРП(б)*, скліканая 15—18.9(28.9—1.10).1917. Яна арганіз. аформіла *Паўночна-Заходнюю абласную арганізацыю РСДРП(б)*, якая аб'яднала парт. арг-цыі Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай, ч. Віленскай губ. і ўсяго Зах. фронту, выбрала яе кіруючы цэнтр — *Паўночна-Заходні абласны камітэт РСДРП(б)*. 5—7(18—20).10.1917 у Мінску адбылася *Другая Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РСДРП(б)* (надзвычайная), якая праходзіла пад знакам непасрэднай падрыхтоўкі сацыяліст. рэвалюцыі і паставіла як найбліжэйшую задачу ўзяць уладу Саветамі ў цэнтры і на месцах. На 2-м Усерас. з'ездзе Саветаў быў 51 дэлегат ад Беларусі, сярод іх 24 бальшавікі. Вял. Кастр. сацыяліст. рэвалюцыя, якую пад кіраўніцтвам Камуніст. партыі і Леніна пачалі рабочыя, рэвалюц. салдаты і матросы Петраграда, была адразу падхоплена на Беларусі. У Мінску Сав. ўлада ўстаноўлена 25 кастр. (7 ліст.), а да 20.11.1917 на ўсёй неакупаванай тэр. Беларусі і на Зах. фронце. Кастр. рэв. выявіла бел. народ ад сац. і нац. прыгнёту, адкрыла яму шырокую дарогу да сацыяліст. дзяржаўнасці, росквіту матэрыяльнага і духоўнага жыцця. Каб замацаваць перамогу Кастрычніка, Паўн.-Зах. абласны к-т РСДРП(б) з 18 да 25.11.1917 склікаў *з'езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў Заходняй вобласці, другі з'езд армій Заходняга фронту*, трэці з'езд Саветаў сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў, якія ўхвалілі дэкрэты Сав. улады, выказалі давер і падтрымку СНК, гатоўнасць абараняць Рэспубліку Саветаў. Парт. арг-цыі Беларусі пад кіраўніцтвам ЦК РСДРП(б) і асабіста У. І. Леніна правялі вял. работу па стварэнні і ўмацаванні органаў дзярж. улады, залучэнні працоўных мас да дзярж. і гасп. буд-ва. *Трэцяя Паўночна-Заходняя абласная і франтавая канферэнцыя РСДРП(б)* [23.12.1917 (5.1.1918)] падвяла вынікі дзейнасці парт. арг-цыі па завалванні і ўмацаванні ўлады Саветаў на Беларусі, вызначыла задачы па мабілізацыі мас на барацьбу з ворагамі пралет. рэвалюцыі, па ажыццяўленні карэнных сацыяліст. пераўтварэнняў.

Бальшавікі Беларусі ў перыяд замежнай ваеннай інтэрвенцыі і грамадзянскай вайны. Утварэнне Кампартыі Беларусі. Пад кіраўніцтвам бальшавікоў працоўныя Беларусі прыступілі да буд-ва новага жыцця. Аднак гэтаму перашкодзілі замежныя імперыялісты, якія ў блоку з унутр. контррэвалюцыяй імкнуліся задушыць Сав. ўладу. У лют. 1918 большую ч. Беларусі акупавалі ням. імперыялісты. У тыле ням. акупантаў бальшавікі стварылі шырокую сетку падпольных арг-цый, вакол якіх фарміравалі паўстанцкія і партыз. атрады.

Гл. Грамадзянская вайна і ваенная інтэрвенцыя ў СССР 1918—20, Падпольныя камуністычныя арганізацыі ў гады грамадзянскай вайны і ваеннай інтэрвенцыі ў СССР, Партызанскі рух на Беларусі ў гады грамадзянскай вайны.

Бальшавікі Беларусі цалкам падтрымлівалі ленінскую знешнюю палітыку. *Чацвёртая Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РКП(б)* (1—4.6.1918), кіруючыся рашэннямі VII з'езду РКП(б), ухваліла *Брэсцкі мір 1918*, вызначыла задачы сав. і парт. буд-ва, мабілізавала камуністаў на барацьбу з голадам і разрухай, умацаванне Сав. улады на неакупаванай тэр. Беларусі. Пасля выгнання ням. акупантаў склаліся ўмовы вырашэння пытання пра дзярж. буд-ва Беларусі. Ажыццяўленнем гэтых задач кіравалі ЦК РКП(б) і У. І. Ленін. Каб абмеркаваць пытанне стварэння БССР і КП(б)Б, Паўн.-Зах. абл. к-т склікаў 30.12.1918 у Смаленску VI Паўн.-Зах. абл. канферэнцыю РКП(б). Канфер. прыняла гістар. пастанову аб утварэнні БССР і аб'явіла сябе *Першым з'ездам КП(б)Б*. І з'езд КП(б)Б адыграў велізарную ролю ў гісторыі бел. народа. Ён арганізацыйна афарміў утварэнне Кампартыі Беларусі як састаўной ч. РКП(б), залажыў фундамент буд-ва Беларускай дзяржавы. 1.1.1919 абнародаваны Маніфест аб утварэнні БССР. Гэты дзень стаў днём нараджэння Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Упершыню за шматвяковую гісторыю бел. народ атрымаў нац. дзяржаўнасць. КП(б)Б, кіруючыся ўказаннямі ЦК РКП(б), правяла вял. работу па скліканні *Першага Усебеларускага з'езду Саветаў* (2—3.2.1919, Мінск), які зацвердзіў Канстытуцыю рэспублікі і выбраў ЦВК БССР. Выказваючы волю бел. народа, з'езд прыняў Дэкларацыю пра неабходнасць тэрміновых перагавораў аб устанаўленні федэратыўнай сувязі БССР з РСФСР. З мэтай злучэння сіл для адпору ворагам у лют. 1919 Савецкая Беларусь і Савецкая Літва аб'ядналіся ў адзіную *Літоўска-Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку* (Літбел). Гэта выклікала неабходнасць аб'яднаць *Камуністычную партыю Літвы і Заходняй Беларусі* (КПЛіЗБ) з Кампартыяй Беларусі. У сак. 1919 Аб'яднаўчы з'езд КПЛіЗБ і КП(б)Б [гл. *Другі з'езд КП(б)Б*] вітаў утварэнне Літбела і пастанавіў аб'яднаць КПЛіЗБ і КП(б)Б у адзіную *Камуністычную партыю (бальшавікоў) Літвы і Беларусі* [КП(б)ЛіБ] як ч. РКП(б). Вялікую ролю ў жыцці партыі і сав. народа адыграў VIII з'езд РКП(б) (сак. 1919). Ён прыняў новую Праграму партыі, распрацаваную У. І. Леніным, якая абагульніла вопыт барацьбы рас. пралетарыяту з эксплуататарамі і вызначыла задачы партыі ў барацьбе за сацыялізм. З'езд прыняў рашэнне аб пераходзе ад палітыкі нейтралізацыі сярэдняка да трывалага саюзу з ім пры апоры на беднату для барацьбы з кулакамі, усімі ворагамі Сав. улады, для прадаўжэння сацыяліст. буд-ва. Рашэнні VIII з'езду РКП(б) абмяркоўваліся ўсімі парт. арг-цыямі Беларусі і былі прыняты імі як праграма практычнай дзейнасці. Бальшавікі мабілізавалі намаганні працоўных рэсп. на адпор класаваму ворагу, паспяховае заканчэнне грамадз. вайны, на ажыццяўленне карэнных сацыяльных пераўтварэнняў.

Літ.-Бел. ССР была адной з ініцыятараў стварэння ваен. саюзу сав. рэспублік. 3.5.1919 урад Літбела заклікаў працоўных рэспублікі аб'яднацца з працоўнымі РСФСР для адпору інтэрвентам і белагвардзейцам. 31.5.1919 Савет абароны Літбела звярнуўся да ўрада РСФСР з прапановай стварыць Саюз Сав. Сацыялістычных Рэспублік для супольнай барацьбы з ворагам. Тое ж прапанавалі Сав. Украіна і Сав. Латвія. 1.6.1919 ВЦВК РСФСР пастанавіў стварыць ваен. саюз сав. рэсп. Расіі, Украіны, Латвіі, Літвы і Беларусі. Аб'яднанне сіл сав. рэсп. адыграла вырашальную ролю ў разгроме інтэрвентаў і белагвардзейцаў. Сотні тысяч беларусаў абаранялі заваёвы Кастрычніка на франтах грамадз. вайны і ў партыз. атрадах, першымі на чале змагароў ішлі камуністы. Навечна ўпісаны ў гісторыю грамадз. вайны імёны У. М. Азіна, І. А. Біча, А. М. Буйко, В. С. Гарбачова, В. С. Гушчы, Е. П. Дубіцкага, А. Г. Зяньковіча, М. С. Мандрыкава, П. М. Шаранговіча і інш., якія змагаліся за ўладу Саветаў за межамі Беларусі. Парт., дзярж. і ваен. работу ў БССР узначальвалі бальшавікі А. Ф. Мяснікоў, В. С. Міцкявічус-Капсукас, В. Г. Кнорын, К. Г. Цыхоўскі, І. Я. Алібегаў, Я. А. Адамовіч, А. Р. Чарвякоў, А. С. Славінскі, В. А. Багуцкі, З. Хв. Жылуновіч, І. С. Уншліхт, М. М. Тухачэўскі, С. І. Берсан, І. П. Убарэвіч і інш.; на акупаванай тэр. Беларусі вызначыліся кіраўнікі камуніст. падполля і партыз. руху: В. А. Аллікевіч, М. Баброва, А. А. Блажко, М. Дзямба, С. Л. Вілюга, С. Р. Жынко, М. А. Ляўкоў, П. Ф. Равінскі, А. Р. Салавей.





Дэлегаты Барысаўскай партканферэнцыі. 1921 (злева). Заняткі на курсах падрыхтоўкі старшынь калгасаў. Гомель. 1930.

У сувязі з тым, што ўладу ў Літве захапіла буржуазія, перад кампартыямі Літвы і Беларусі сталі розныя задачы. Паводле санкцыі ЦК РКП(б) у вер. 1920 КП(б)ЛіБ падзелена на самастойныя партыі: Камуніст. партыю Беларусі і Камуніст. партыю Літвы. *Трэці з'езд КП(б)Б* (22—25.11.1920) падагуліў вынікі ўзбр. барацьбы працоўных Беларусі за Сав. ўладу і аб'явіў гал. задачай партыі ўмацаванне ў рэспубліцы дыктатуры пралетарыяту, устанаўленне ўзорнага сав. парадку, правядзенне далейшых рэвалюц. пераўтварэнняў.

Кампартыя Беларусі ў барацьбе за аднаўленне і перабудову народнай гаспадаркі рэспублікі на аснове новай эканамічнай палітыкі. Пасля грамадз. вайны КП(б)Б пад кіраўніцтвам ЦК РКП(б) узначаліла барацьбу працоўных БССР за аднаўленне нар. гаспадаркі. Беларусь была спустошана войнамі, амаль палову яе тэр. захапіла бурж. Польшча (гл. *Заходняя Беларусь*), нар. гасп. паралізавана разрухаю. *Чацвёрты з'езд КП(б)Б* (25.2—2.3.1921) праходзіў ва ўмовах жорсткай барацьбы супраць трацкістаў, «рабочай апазіцыі», «дэцыстаў» і інш. антыленінскіх груповак. $^3/_4$ дэлегатаў з'езду прагаласавалі за ленінскую платформу. Гэта было сведчаннем вернасці камуністаў Беларусі ленінізму, іх згуртавання вакол ЦК РКП(б). З'езд выпрацаваў мераприемствы для ўмацавання адзінства радоў КП(б)Б, узмацнення тэарэт. падрыхтоўкі камуністаў, паляпшэння паліт. работы сярод працоўных. КП(б)Б накіравала творчую энергію мас на аднаўленне нар. гасп., змагалася за ўстанаўленне эканам. змычкі паміж горадам і вёскай, умацаванне саюзу рабочага класа і сялянства. Рабіліся захады па падрыхтоўцы парт., сав. і гасп. кадраў. Вынікі дзейнасці КП(б)Б па ажыццяўленні рашэнняў X з'езду і X канфер. РКП(б) падвёў *Пяты з'езд КП(б)Б* (15—20.10.1921). З'езд прааналізаваў эканам. становішча Беларусі, ухваліў работу КП(б)Б па ажыццяўленні ленінскага Дэкрэта аб зямлі, перабудову сістэмы кіравання прамысловасцю, новую эканам. палітыку (нэп) як адзіна правільны шлях умацавання саюзу рабочага класа і сялянства. *Шосты з'езд КП(б)Б* (15—19.3.1922) адзначыў умацаванне эканам. і паліт. становішча рэс-

публікі, паставіў гал. задачай павысіць тэмпы аднаўлення нар. гасп., намеціў меры паляпшэння работы прафсаюзаў і камсамола. Жыццёвыя інтарэсы бел. народа, як і інш. народаў краіны, патрабавалі аб'яднання сав. рэсп. у адзіны саюз. Працоўныя БССР на чале з КП(б)Б горача падтрымалі ленінскую ідэю стварэння СССР і аб'яднання ў ім РСФСР, УССР, БССР і ЗСФСР на прынцыпах добраахвотнасці, раўнапраўя і суверэнітэту. Стварэнне СССР (1922) — трыумф ідэй ленінізма, ленінскай нац. палітыкі. Упершыню ў гісторыі чалавецтва быў знойдзены шлях вырашэння нац. пытання — аб'яднанне народаў у адзіную братэрскую сям'ю для пабудовы сацыялізма і камунізма.

Уступленне БССР у братэрскую сям'ю сав. рэспублік нязмерна ўмацавала суверэнітэт бел. народа, які гарантуецца ўсёй паліт., эканам. і ваен. магутнасцю СССР. Гэты гістар. акт стварыў спрыяльныя ўмовы для ўсебаковага развіцця эканомікі і культуры рэспублікі, для далейшай кансалідацыі і росквіту бел. сацыяліст. нацыі. *Сёмы з'езд КП(б)Б* (20—26.3.1923) ад імя камуністаў рэсп. выказаў глыбокае задавальненне стварэннем СССР. Ён падагуліў вынікі работы КП(б)Б ва ўмовах нэпа, вызначыў меры па рэгуляванні складу партыі, умацаванні парт. ячэек, паляпшэнні іх выхаваўчай работы, патрабаваў большай увагі ўздыму цяжкай прамысл., паставіў пытанне пра ўзбуйненне БССР. У маі 1923 ЦК РКП(б) прыняў пастанову аб расшырэнні граніц БССР за кошт сумежных паветаў Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губ. з большасцю бел. насельніцтва і стварыў спец. камісію з прадстаўнікоў ЦК, ЦКК РКП(б) і мясц. парт. арг-цый. 3.3.1924 ЦВК СССР выдаў дэкрэт аб далучэнні да БССР шэрагу пав. Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губ. Практычную работу па ўзбуйненні БССР праводзіла *Часовае Беларускае Бюро ЦК РКП(б)*, якому былі перададзены функцыі ЦБ КП(б)Б. VI з'езд Саветаў Беларусі (надзвычайны) (13—16.3.1924) заканадаўча аформіў узбуйненне БССР. Гэта спрыяла далейшаму паліт., эканам. і культ. развіццю рэспублікі. *Восьмы з'езд КП(б)Б* (12—14.5.1924) выказаў глыбокі смутак з прычыны смерці У. І. Леніна і заклікаў працоўных цясней згуртавацца вакол РКП(б). Ён далучыўся да рэалюцыі XIII канфер. РКП(б), якая асудзіла троцкісцкую апазіцыю як дробнабурж. ўхіл, рэвізію бальшавізму, як яўны адыход ад ленінізма; адзначыў поспехі ў аднаўленні прамысл., с. гасп., вызначыў задачы па паляпшэнні парт. кіраўніцтва гасп. і культ. буд-вам, Саветамі, прафсаюзамі і камсамолам рэспублікі.

Парт. і дзярж. работу на Беларусі ў аднаўленчы перыяд узначальвалі Я. А. Адамовіч, А. М. Асаткін-Уладзімірскі, М. М. Галадзед, В. А. Багуцкі, В. Г. Кнорын, А. І. Крыніцкі, А. С. Славінскі, А. Р. Чарвякоў, Ш. Ш. Ходаш, В. Ф. Шаранговіч і інш.

Пад кіраўніцтвам Камуніст. партыі сав. народ на аснове нэпа дасягнуў вял. поспехаў. У канцы аднаўленчага перыяду перад партыяй паўстала пытанне перспектыў далейшага развіцця краіны. XIV канфер. РКП(б) (1925) падкрэсліла, што ў СССР ёсць усё неабходнае і дастатковае для пабудовы сацыялізма. Ленінская ўстаноўка на перамогу сацыялізма ў СССР стала законам партыі. *Дзевяты з'езд КП(б)Б* (8—12.12.1925) ухваліў паліт. лінію партыі, падвёў вынікі аднаўлення нар. гасп. рэспублікі і вызначыў чарговыя задачы КП(б)Б у сацыяліст. буд-ве: узмацненне прамысл. як асновы сацыяліст. гасп. і апоры дыктатуры пралетарыяту; залучэнне да сацыяліст. буд-ва сялянства шляхам кааперавання; культ. ўздым працоўных.

Барацьба КП(б)Б за сацыялістычную індустрыялізацыю і калектывізацыю сельскай гаспадаркі рэспублікі. На аснове рашэнняў XIV з'езду ВКП(б), які ўзяў курс на сацыяліст. індустрыялізацыю краіны, і IX з'езду КП(б)Б парт. арг-цыі рэсп. разгарнулі паліт. і арганіз. работу па мабілізацыі працоўных на сацыяліст. індустрыялізацыю БССР. У развіцці прамысловасці Беларусь апіралася на дапамогу ўсіх сав. народаў. Першыя вынікі індустрыялізацыі рэсп. падвёў *Дзесяты з'езд КП(б)Б* (3—10.1.1927). Ён даў дырэктыву паскорыць буд-ва эл. станцый, прамысл. прадпрыемстваў, змагацца за павышэнне прадукцыйнасці працы. З'езд адзначыў узмацненне пазіцый сацыялізма ў вёсцы, падкрэсліў неабходнасць усямерна падтрымліваць калектывізацыю с. гасп., канстатаваў поспехі ў развіцці культуры. КП(б)Б, згуртаваная вакол ЦК ВКП(б), рашуча выступіла супраць троцкісцка-зіноўеўскага блоку, які адмаўляў магчымасць перамогі сацыялізма ў СССР, неабходнасць сацыяліст. індустрыялізацыі, рабіў замах на адзінства партыі. КП(б)Б адзінадушна ўхваліла рашэнні кастр. і ліст. 1927 аб'яднаных пленумаў ЦК і ЦКК ВКП(б), якія выключылі Троцкага і Зіноўева з ЦК і з партыі, вывелі з складу чл. ЦК і ЦКК інш. фракцыянераў; выключыла з сваіх радоў актыўных апазіцыянераў, рашуча змагалася супраць вялікадзярж. шавінізму і мясцовага нацыяналізму, няўхільна праводзіла ленінскую нац. палітыку. У абставінах вял. поспехаў, якіх дасягнула БССР у буд-ве сацыялізма, адбыўся *Адзінаццаты з'езд КП(б)Б* (22—29.11.1927). З'езд ухваліў паліт. і арганіз. дзейнасць ЦК, накіраваную на зберажэнне адзінства партыі, адзначыў поспехі сацыяліст. індустрыялізацыі, на падставе тэзісаў ЦК да XV з'езду ВКП(б) і дырэктыў ЦК ВКП(б) па 1-м пяцігадовым плане развіцця нар. гасп. СССР прыняў асноўныя накіды пяцігадовага плана развіцця нар. гасп. БССР, паставіў задачу кааперавання с. гасп., вызначыў мерапрыемствы культ. буд-ва. КП(б)Б правяла вял. работу па растлумачэнні рашэнняў XV з'езду ВКП(б), які ўзяў курс на калектывізацыю с. гасп., па мабілізацыі працоўных на выкананне планаў развіцця прамысл., па перабудове с. гасп. на калектыўных пачатках, па барацьбе з кулацтвам і правым ухілам. Важную ролю ў барацьбе за сацыяліст. індустрыялізацыю і калектывізацыю с. гасп., у выкрыцці правых капітулянтаў адыграў *Дванаццаты з'езд КП(б)Б* (5—16.2.1929), які асудзіў антыленінскую платформу і раскольніцкую дзейнасць правых капітулянтаў групы Бухарына, бурж. нацыяналістаў на Беларусі, патрабаваў рашуча змагацца з адхіленнямі ад генеральнай лініі партыі. З'езд зацвердзіў кантрольныя лічбы пяцігадовага плана развіцця нар. гасп. і культуры БССР, заклікаў працоўных разгарнуць сацыяліст. спаборніцтва за датэрміновае выкананне пяцігодкі. Выконваючы рашэнні з'езду, КП(б)Б ажыццявіла шэраг мер па далейшым павышэнні ўзроўню арганіз. і паліт. работы, развіцці ўнутрыпарт. дэмакратыі, умацаванні адзінства парт. радоў.

У абставінах наступлення сацыялізма па ўсім фронце сабраўся *Трынаццаты з'езд КП(б)Б* (30.5—12.6.1930). Ён абмеркаваў ход выканання пяцігадовага плана развіцця прамысл., калектывізацыі, задачы прафсаюзаў рэсп. ў перыяд рэканструкцыі. З'езд пастанавіў прадаўжаць цвёрды курс на развіццё прамысл. і павелічэнне яе ўдзельнай вагі ў нар. гасп., вызначыў меры па ліквідацыі памылак і скрыўленняў у калгасным буд-ве. Адзначыўшы дасягненні ў ажыццяўленні ленінскай нац. палітыкі, з'езд патрабаваў узмацніць работу па інтэрнац. выхаванні працоўных, умацаванні дружбы народаў СССР. Папярэднія вынікі 1-й пяцігодкі падвёў *Чатырнаццаты з'езд КП(б)Б* (23—29.1.1932). Ён зацвердзіў план развіцця прамысл. БССР на 1932, патрабаваў ад парт. і сав. органаў палітычнага і арганіз.-гасп. ўмацавання калгасаў, ухваліў дырэктывы ЦК ВКП(б) па 2-м пяцігадовым плане развіцця нар. гасп. СССР на 1933—37, прадстаўленыя на зацвярджэнне XVI канфер. ВКП(б), і даручыў ЦК КП(б)Б распрацаваць 2-і пяцігадовы план развіцця нар. гасп. БССР. КП(б)Б аддавала шмат увагі ідэалаг. рабоце, камуніст. выхаванню працоўных, барацьбе супраць бурж. ідэалогіі. Яна няўхільна ажыццяўляла ленінскую нац. палітыку, умацоўвала дружбу паміж бел., рус. і інш. народамі СССР, выкрывала рэцыдывы вялікадзяржаўнага шавінізму і бел., польск., яўр. нацыяналізму. На ўсіх з'ездах КП(б)Б, пленумах ЦК, у парт. арг-цыях сістэматычна абмяркоўваліся пытанні практычнага ажыццяўлення нац. палітыкі ў рэспубліцы.

Дзейнасць КП(б)Б па заканчэнні сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі. Перамога сацыялізма ў СССР. *Пятнаццаты з'езд КП(б)Б* (16—22.1.1934) адзначыў выратшальныя перамогі сацыялізма ў нар. гасп. БССР, канстатаваў, што Беларусь стала адной з перадавых індустрыяльна-калгасных рэсп., намнога палепшыўся матэрыяльны дабрабыт і культ. ўзровень працоўных. Пры вызначэнні задач КП(б)Б з'езд кіраваўся тэзісамі дакладаў па 2-м пяцігадовым плане развіцця нар. гасп. СССР і па арганіз. пытаннях парт. і сав. буд-ва да XVII з'езду ВКП(б). У барацьбе за датэрміновае выкананне 2-й пяцігодкі ва ўсёй краіне, у т. л. і ў БССР, шырока разгарнулася сацыяліст. спаборніцтва, рух стаханаўцаў, наватараў прамысл. і с. гаспадаркі. 2-я пяцігодка, як і 1-я, была выканана датэрмінова. *Шаснаццаты з'езд КП(б)Б* (10—19.6.1937) падвёў вынікі сацыяліст. буд-ва ў рэсп. за 2-ю пяцігодку і даў указанне ЦК КП(б)Б і СНК скласці 3-і пяцігадовы план развіцця нар. гасп. БССР. Гал. вынік 2-й пяцігодкі — перамога ва ўсіх галінах нар. гасп. СССР, у т. л. і БССР, сацыяліст. вытворчых адносін, стварэнне новай, сацыяліст. эканомікі.

За гады першых пяцігодак пабудавана больш за 1700 прамысл. прадпрыемстваў, у т. л. БелДРЭС, «Гомсельмаш», Бабруйскі дрэваапрацоўчы і Аршанскі льняны камбінаты, станкабуд. з-д і швейная ф-ка «Сцяг індустрыялізацыі» ў Віцебску і інш. Ажыццяўленне ленінскага кааператыўнага плана дало магчымасць перавесці раздробленую с.-г. вытворчасць Беларусі на рэйкі буйной, механізаванай калектыўнай гаспадаркі. У рэспубліцы была ліквідавана непісьменнасць, створана шырокая сетка агульнаадук. школ, сярэдніх спец. і вышэйшых навуч. устаноў, НДІ, Акадэмія навук, выхавана сав. інтэлігенцыя. Атрымала ўсебаковае развіццё культура бел. народа, сацыяліст. па змесце і нац. па форме. Марксісцка-ленінская ідэалогія авалодала свядомасцю мільёнаў працоўных. Парт. і дзярж. работу ў БССР у перыяд буд-ва сацыялізма ўзначальвалі Д. І. Валковіч, І. А. Васілевіч, М. М. Галадзед, Я. Б. Гамарнік, К. В. Гей, М. Ф. Гікала, В. Г. Кнорын, П. К. Панамарэнка, А. Р. Чарвякоў, В. Ф. Шаранговіч і інш.

Перамога сацыялізма і звязаныя з ёю глыбокія змены ў эканоміцы і класавай структуры сав. грамадства замацаваны ў новай Канстытуцыі СССР, на аснове якой распрацавана Канстытуцыя БССР, прынятая 15.2.1937 XII надзвычайным з'ездам Саветаў БССР.

Дзейнасць КП(б)Б па ўмацаванні сацыялістычнага грамадства. *Семнаццаты з'езд КП(б)Б* (10—18.6.1938) абавязаў парт., сав. і гасп. органы забяспечыць далейшы ўздым прамысл., с. гасп. і культуры рэсп., вызначыў задачы КП(б)Б у галіне парт.-арганіз. і паліт. работы, па кіраўніцтве ЛКСМБ. Поспехі СССР, росквіт эканомікі і культуры БССР зрабілі велізарны ўплыў на рэвалюц. рух у Зах. Беларусі, які ўзначальвала *Камуністычная партыя Заходняй Беларусі* (КПЗБ). У вер. 1939 адбылося *ўз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР.* Пад кіраўніцтвам КП(б)Б, з дапамогай усіх народаў СССР у зах. абласцях рэсп. ажыццяўляліся рэвалюц. пераўтварэнні, пераадольвалася эканам. і культурная адсталасць. *Васемнаццаты з'езд КП(б)Б* (15—20.5.1940)

Члены дэлегацыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ў час паездкі па каналу Масква — Волга. Сярод іх П. К. Панамарэнка. 1939.





Група партызанаў Мінскага і Пінскага партызанскіх злучэнняў. На пярэднім плане: сакратар Пінскага падпольнага абкома КП(б)Б А. Я. Кляшчоў (3-і злева), сакратары Мінскага падпольнага абкома В. І. Казлоў, І. А. Бельскі (4-ы і 5-ы злева), камандзір партызанскага атрада К. П. Арлоўскі (8-ы справа).

адзначыў поспехі ў развіцці прамысл., с. гасп., культуры, вызначыў меры паляпшэння парт.-арганіз. і паліт. работы. Улічваючы напружанае міжнар. становішча і пагран. размяшчэнне БССР, з'езд падкрэсліў неабходнасць умацоўваць абараназдольнасць зах. рубяжоў краіны, павышаць рэвалюц. пільнасць і мабілізацыйную гатоўнасць бел. народа. На падставе рашэнняў XVIII з'езду ВКП(б) і XVIII з'езду КП(б)Б парт. арг-цыі БССР узначалілі барацьбу за датэрміновае выкананне 3-й пяцігодкі.

КП(б)Б у гады Вялікай Айчыннай вайны. З першых дзён *Вялікай Айчыннай вайны Савецкага Саюза 1941—45* КП(б)Б выступіла арганізатарам і кіраўніком барацьбы бел. народа супраць ням.-фаш. захопнікаў. Па агульнай і парт. мабілізацыі КП(б)Б накіравала ў дзейную армію больш за палову свайго складу і больш за 130 тыс. камсамольцаў, а ўсяго — 1 млн. чал., арганізавала эвакуацыю ў сав. тыл насельніцтва (каля 1,5 млн. чал.), прамысл. прадпр., дзярж. і калгасна-кааператыўнай маёмасці. На акупаванай тэр. Беларусі стваралася сетка камуніст. падполля, разгарнулася ўсенародная барацьба супраць ням.-фаш. захопнікаў. Дзейнічалі падпольныя 10 абкомаў, 185 міжрайкомаў, гаркомаў і райкомаў КП(б)Б, 1316 пярвічных парт. арг-цый, якія аб'ядноўвалі больш за 35 тыс. камуністаў. Пад кіраўніцтвам КП(б)Б дзейнічалі камсамольскае падполле і антыфаш. рух. Усю арганіз. і паліт. работу ў тыле ворага КП(б)Б падпарадкоўвала гал. задачы — усебаковаму развіццю партыз. руху, узмацненню барацьбы супраць акупантаў. Для кіраўніцтва партыз. рухам быў створаны аператыўны орган ЦК КП(б)Б — *Беларускі штаб партызанскага руху* (БШПР). Ва ўсіх абласцях Беларусі ЦК КП(б)Б меў сваіх упаўнаважаных і сувязных, рэгулярна пасылаў у тыл праціўніка сав. л-ру. На акупаванай тэр. выдаваліся 162 падпольныя газеты. Працоўныя Беларусі, выхаваныя Камуніст. партыяй у духу палымянага сав. патрыятызму, самааддана сталі на абарону Айчыны. У шматлікіх атрадах нар. мсціўцаў, у антыфаш. падполлі супраць захопнікаў змагалася больш як 440 тыс. мужчын і жанчын, каля 400 тыс. чал. складалі арганізаваны партыз. рэзерв. З ворагам фактычна змагаўся ўвесь бел. народ. Падпольныя арг-цыі КП(б)Б згуртоўвалі бел. народ вакол партыі, умацоўвалі веру ў перамогу над ворагам. Камуністы былі прыкладам мужнасці і вернасці Радзіме. Многія з іх загінулі ў барацьбе з акупантамі. На месца тых, што загінулі, прыходзілі новыя змагары. За перыяд работы ў падполлі парт. арг-цыі Беларусі прынялі ў свае рады каля 10 тыс. чал.

Падрыхтоўкай парт. арг-цый рэспублікі да работы ў падполлі і разгортваннем партыз. руху на акупаванай тэр. БССР займаліся сакратары ЦК КП(б)Б П. К. Панамарэнка, П. З. Калінін, У. Р. Ванееў, У. Н. Малін, М. Я. Аўхімовіч, Ц. С. Гарбуноў, І. І. Рыжыкаў, І. П. Ганенка, Р. Б. Эйдзінаў. Выдатнымі арганізатарамі і кіраўнікамі камуніст. падполля і партыз. руху паказалі сябе К. П. Арлоўскі, І. І. Баброў, Ф. А. Баранаў, І. А. Бельскі, С. Р. Вайцаховіч, С. А. Ваўпшасаў, І. Дз. Вятроў, Я. А. Жылянін, К. С. Заслонаў, М. В. Зімянін, В. І. Казлоў, П. П. Капуста, І. Ф. Клімаў, А. Я. Кляшчоў, І. П. Кожар, В. З. Корж, М. Е. Крыштафовіч, А. А. Куцак, У. Е. Лабанок, К. Т. Мазураў, М. І. Малінін, А. А. Манахаў, Д. С. Маўчанскі, Р. Н. Мачульскі, П. М. Машэраў, І. Б. Пазнякоў, М. І. Пліс, М. П. Пакроўскі, С. В. Прытыцкі, В. Е. Самуцін, С. І. Сікорскі, І. А. Стулаў, Ф. А. Сурганаў, І. П. Урбановіч, В. Я. Чарнышоў, М. П. Шмыроў, Ф. М. Языковіч і іншыя. Гл. таксама *Партыйнае падполле ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Абласныя падпольныя камітэты КП(б)Б, Міжраённыя падпольныя камітэты КП(б)Б, Раённыя падпольныя камітэты КП(б)Б, Партызанскі рух на Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Камсамольскія падпольныя арганізацыі, Абласныя падпольныя камітэты ЛКСМБ, Антыфашысцкія арганізацыі.*

Сакратар Пінскага падпольнага абкома КП(б)Б С. Р. Вайцаховіч гутарыць з сялянамі вёскі Хорастава Ленінскага раёна. 1943.



Паводле ацэнкі КПСС і Сав. ўрада, усенародная партыз. барацьба на захопленай ворагам бел. зямлі з'явілася вялікім укладам у разгром ням.-фаш. захопнікаў.

Барацьба Кампартыі Беларусі за аднаўленне народнай гаспадаркі і далейшае развіццё сацыялістычнага грамадства. Пасля вызвалення Беларусі ад ням.-фаш. акупантаў КП(б)Б мабілізавала працоўных рэсп. на дапамогу Сав. Арміі, каб канчаткова разграміць ворага, сканцэнтравала свае намаганні на аднаўленні і далейшым развіцці нар. гасп. Акупанты прычынілі Беларусі велізарныя страты. Яны загубілі больш за 2 млн. грамадзян, разбурылі і разрабавалі ўсё, што было створана працай народа. Пад мудрым кіраўніцтвам Камуніст. партыі, з братняй дапамогай народаў СССР працоўныя Беларусі пераадолелі гэтыя цяжкасці і ў сціслыя тэрміны аднавілі нар. гасп. рэспублікі. Пытанні мабілізацыі сіл народа на паскарэнне аднаўлення і далейшае развіццё прадукцыйных сіл рэспублікі, паляпшэння дабрабыту народа стаялі ў цэнтры ўвагі *Дзевятнаццатага з'езду КП(б)Б* (15—18.2.1949). Дзякуючы нястомным клопатам ЦК ВКП(б) і Сав. ўрада, бел. народ паспяхова выканаў 4-ы пяцігадовы план. Прамысл. БССР, якая на пач. 1946 была на ўзроўні 1928, выпусціла ў 1950 прадукцыі на 15% больш, чым у 1940. Аднаўленне прамысл. ішло на больш высокай тэхн. аснове, ствараліся новыя галіны прамысл.: аўтамабільная, трактарная, лакамабільная, дарожнага машынабудавання. Адноўленыя пасля вызвалення БССР калгасы па найважнейшых галінах с.-г. вытв. перавысілі даваенны ўзровень, у асноўным была закончана калектывізацыя ў зах. абласцях рэспублікі. Праведзена вял. работа па аднаўленні і рэканструкцыі гарадоў, хуткімі тэмпамі ішло жыллёвае буд-ва, развіваліся навука і культура. *Дваццаты з'езд КП(б)Б* (20—23.9.1952) абмеркаваў справаздачы кіруючых органаў КП(б)Б, ухваліў праекты ЦК ВКП(б) «Дырэктывы XIX з'езду партыі па пяцігадовым плане развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1951—55 г.» і «Тэкст зменeнага Статута партыі» і абавязаў партыйныя арганізацыі забяспечыць выкананне 5-й пяцігодкі, уздымаць усе галіны нар. гасп., матэрыяльны дабрабыт, ахову здароўя і культ. ўзровень бел. народа. У адпаведнасці з рашэннямі XIX з'езду КПСС аб зменах у Статуце і змене назвы партыі Камуніст. партыя (бальшавікоў) Беларусі [КП(б)Б] стала называцца Камуніст. партыяй Беларусі (КПБ). Вынікі сацыяліст. спаборніцтва працоўных па датэрміновым выкананні 5-га пяцігадовага плана падвёў *Дваццаць першы з'езд КПБ* (10—13.2.1954). Ён адзначыў поспехі ў развіцці народнай гаспадаркі БССР, патрабаваў ад партыйных і гасп. органаў дабіцца далейшага паляпшэння работы прамысловасці, паскорыць увод энергамагутнасцей, тэмпы жыллёвага і камунальна-бытавога буд-ва. З'езд выявіў сур'ёзныя недахопы ў кіраўніцтве с. гасп., абавязаў парт. арг-цыі накіраваць усе сілы на датэрміновае выкананне плана 5-й пяцігодкі і рашэнняў вераснёўскага (1953) Пленума ЦК КПСС па пытаннях с. гасп., павысіць узровень паліт. і арганіз. работы ў масах. *Дваццаць другі з'езд КПБ* (22—24.1.1956) падвёў вынікі 5-й пяцігодкі, ухваліў праект ЦК КПСС «Дырэктывы XX з'езду КПСС па 6-м пяцігадовым плане развіцця нар. гасп. СССР на 1956—60 г.» і даручыў ЦК КПБ і СМ БССР на іх аснове распрацаваць 6-ы пяцігадовы план развіцця нар. гасп. рэспублікі. З'езд абавязаў парт., сав. і гасп. органы разгарнуць сацыяліст. спаборніцтва за датэрміновае выкананне заданняў пяцігодкі, дабіцца павышэння прадукцыйнасці працы, знізіць сабекошт і павысіць якасць прадукцыі, распрацаваў мерапрыемствы на паляпшэнне ідэалаг. і ўнутрыпарт. работы. Важнай вяхой у жыцці партыі, сав. народа, міжнар. камуніст. і рабочага руху з'явіўся XX з'езд КПСС (14—25.2.1956). Ён вызначыў новыя задачы партыі ў галінах унутранай і знешняй палітыкі, ухваліў праведзеную ЦК КПСС работу па далейшым развіцці ленінскіх нормаў парт. жыцця і прынцыпаў калектыўнасці кіраўніцтва, падкрэсліў неабходнасць удасканалення стылю і метадаў парт. работы. Вялікую ўвагу звярнуў з'езд на далейшае ўмацаванне і развіццё сав. грамадскага і дзярж. ладу, саюзу рабочага класа і сялянства, дружбы народаў СССР. Выконваючы рашэнні XX з'езду КПСС і пастанову ЦК КПСС ад 30.6.1956 «Аб пераадоленні культу асобы і яго вынікаў», КПБ разгарнула работу па аднаўленні ленінскіх нормаў парт., дзярж. і грамадскага жыцця, мабілізавала працоўных на дасягненне новых поспехаў у развіцці нар. гасп. і культуры.

Парт. і дзярж. работу на Беларусі ў гэты перыяд вялі: П. А. Абрасімаў, М. Я. Аўхімовіч, М. І. Баскакаў, Ц. С. Гарбуноў, М. І. Гусараў, В. І. Закурдаеў, М. С. Зімянін, А. Я. Кляшчоў, І. Ф. Клімаў, В. І. Казлоў, К. Т. Мазураў, І. М. Макараў, М. С. Патолічаў, С. К. Цімашэнка, В. Я. Чарнышоў і інш.

Нарада перадавікоў сельскай гаспадаркі Беларусі. З прамовай выступае К. Т. Мазураў. 1958.





Дэлегаты XXIV з'езду КПБ паэты П. Ф. Глебка і М. Танк (Я. І. Скурко), народныя артысты СССР А. К. Ільінскі і Л. П. Александроўская, пісьменнік І. П. Шамякін у перапынку паміж пасяджэннямі. 1960.

Кампартыя Беларусі ў барацьбе за будаўніцтва камуністычнага грамадства. *Дваццаць трэці з'езд КПБ* (нечарговы) 14—15.1.1959 падвёў вынікі ўсенар. абмеркавання і зацвердзіў кантрольныя лічбы развіцця нар. гасп. БССР на 1959—65. Капіталаўкладанні ў нар. гасп. рэсп. планаваліся 32 млрд. руб., амаль столькі, колькі выдаткавана за ўвесь час існавання БССР. XXI з'езд КПСС (нечарговы, 27.1—5.2.1959) зрабіў важны вывад, што сацыялізм у СССР перамог поўнасцю і канчаткова. Наша краіна ўступіла ў новы перыяд свайго развіцця — перыяд разгорнутага буд-ва камунізма. З'езд вызначыў задачы партыі ў галіне эканам., паліт., ідэалаг. і міжнар. адносін, зацвердзіў кантрольныя лічбы развіцця нар. гасп. СССР на сямігодку. У абставінах барацьбы сав. народа за выкананне сямігодкі праходзіў *Дваццаць чацвёрты з'езд КПБ* (17—19.2.1960), які адзначыў поспехі ў развіцці прамысл., с. гасп., навукі і культуры, абавязаў камуністаў шырэй разгарнуць усенар. сацыяліст. спаборніцтва за датэрміновае выкананне заданняў сямігодкі. *Дваццаць пяты з'езд КПБ* (26—28.9.1961) падвёў вынікі абмеркавання распрацаваных ЦК КПСС праектаў Праграмы і Статута КПСС, аднадушна ўхваліў іх і заклікаў камуністаў рэсп. яшчэ цясней згуртавацца вакол ленінскага ЦК. Працоўныя Беларусі з натхненнем сустрэлі рашэнні XXII з'езду КПСС і выказалі гатоўнасць самааддана змагацца за ператварэнне ў жыццё трэцяй Праграмы КПСС — праграмы пабудовы камунізма ў нашай краіне. КПБ аднадушна ўхваліла рашэнні кастрычніцкага і лістападаўскага (1964) Пленумаў ЦК КПСС, накіраваных на ажыццяўленне калектыўна распрацаванай лініі партыі, выказанай у Праграме КПСС. *Дваццаць шосты з'езд КПБ* (3—5.3.1966) адзначыў, што аб'ём прамысл. вытв. за сямігодку павялічыўся ў 2,1 раза пры плане 1,8. Уведзены ў дзеянне больш за 300 прамысл. прадпр. і цэхаў. Валавая прадукцыя с. гасп. павялічылася ў 1,7, у т. л. жывёлагадоўлі ў 2,1 раза. З'езд абавязаў ЦК, абкомы, гаркомы і райкомы КПБ дабіцца далейшага ўзмацнення накіроўваючай і мабілізуючай ролі парт. арг-цый у гасп. і культ. буд-ве, сарыентаваў іх на пераход прадпр. на новую сістэму планавання і эканам. стымулявання, павышэнне эфектыўнасці грамадскай вытв., паскарэнне тэхн. прагрэсу. У галіне с. гасп. з'езд паставіў задачу выканаць рашэнні сакавіцкага (1965) Пленума ЦК КПСС і забяспечыць трывалы рост с.-г. вытворчасці. З'езд ухваліў праект Дырэктыў XXIII з'езду КПСС па пяцігадовым плане развіцця нар. гасп. СССР на 1966—70. Апіраючыся на высокі працоўны і паліт. ўздым, выкліканы падрыхтоўкай да 50-годдзя Вял. Кастр. сацыяліст. рэвалюцыі, 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна, 50-годдзя КПБ і БССР, Кампартыя Беларусі паспяхова выканала задачы, пастаўленыя XXIII з'ездам КПСС і XXVI з'ездам КПБ.

У абставінах усенар. сацыяліст. спаборніцтва за дастойную сустрэчу XXIV з'езду КПСС 22—24.2.1971 адбыўся *Дваццаць сёмы з'езд КПБ*. Ён абмеркаваў справаздачны даклад ЦК КПБ і даклад аб праекце Дырэктыў XXIV з'езду КПСС на пяцігадовым плане развіцця нар. гасп. СССР на 1971—75. З'езд адзначыў, што справаздачны перыяд характарызуецца дынамічным ростам грамадскай вытв., маштабаў капітальнага буд-ва, інтэнсіўным развіццём эканомікі рэспублікі. 8-ы пяцігадовы план па асн. паказчыках прамысл. вытворчасці выкананы датэрмінова — у кастр. 1970. Аб'ём прамысл. прадукцыі вырас у 1,8 раза пры плане 1,7. Перавыкананы заданне па прадукцыйнасці працы, у прамысловасці яна выросла на 39%. Пабудавана больш за 60 прамысл. прадпрыемстваў. Капіталаўкладанняў асвоена ў 1,7 раза больш, чым у 7-й пяцігодцы. Валавая прадукцыя калгасаў і дзяржгасаў за 8-ю пяцігодку ў параўнанні з папярэдняй выросла на 45%, а прадукцыйнасць працы на 50%. Датэрмінова выкананы план нарыхтовак асн. відаў с.-г. прадукцыі. Павысіўся матэрыяльны дабрабыт і культ.-масавае

Ветэран партыі, удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны Ф. Ф. Юрчак і былы матрос крэйсера «Аўрора» Ц. П. Барысік сярод піянераў Слонімскага раёна. 1960.













Камуністычная партыя Беларусі

1—2. Будынак на Ленінградскай вуліцы ў Мінску, у якім у 1917 размяшчаўся Паўночна-Заходні абласны камітэт РСДРП(б). Мемарыяльная дошка на гэтым будынку.
3. Будынак у Смаленску, у якім 30—31.12.1918 адбыўся I з'езд КП(б)Б.
4. Партыйна-камсамольская канферэнцыя Рэчыцкага павета абмяркоўвае пытанне пра мабілізацыю сіл на барацьбу з Дзянікіным. 1919.
5. Праводзіны камуністаў на польскі фронт. Мінск. 1920.
6. Члены калгаса «Бальшавік» Капыльскага раёна вывучаюць рашэнні XVI з'езду ВКП(б). 1931.
7. Нарком лёгкай прамысловасці БССР А. Я. Балцін гутарыць з групай дэлегатаў рэспубліканскай канферэнцыі «За авалоданне тэхнікай». 1934.
8. М. І. Калінін, А. Р. Чарвякоў, М. М. Галадзед, М. Ф. Гікала, Д. І. Валковіч на трыбуне ў час дэманстрацыі працоўных Мінска, прысвечанай уручэнню БССР ордэна Леніна. 1935.



6



7



8











Камуністычная партыя Беларусі II.

1. Партыйны сход у партызанскім атрадзе імя «Правды» брыгад імя «Правды». 1943.
2. Прыём у партыю партызанаў брыгады «Жалязняк» на пасяджэнн бюро Бягомльскага падпольнага райкома КП(б)Б (2-і злева сакра тар райкома С. С. Манковіч).
3. Пасяджэнне партбюро ў калгасе «Камінтэрн» Магілёўскага раён Выступае старшыня калгаса І. В. Сяргееў. 1961.
4. Мітынг, прысвечаны пуску 1-й чаргі Салігорскага калійнага ка біната. 1964.
5. Сакратар парткома саўгаса «Асіповіцкі» М. В. Елісееў гутарыц з механізатарамі пра ход палявых работ. 1965.
6. Уручэнне БССР ордэна Кастрычніцкай Рэвалюцыі на ўрачыстым пасяджэнні ЦК КПБ і Вярхоўнага Савета БССР, прысвечаным 50-годдзю БССР і КПБ. Злева направа: П. М. Машэраў, Л. І. Брэжнеў, С. В. Прытыцкі, Ц. Я. Кісялёў. 1968.
7—8. Дэманстрацыя працоўных Мінска ў дзень святкавання 50-год дзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. 1967.



6



7



8



Камуністычная партыя Беларусі III.

1. Прэзідыум XXVII з'езду КПБ. Са справаздачным дакладам выступае першы сакратар ЦК КПБ П. М. Машэраў. 1971.
2. У зале пасяджэнняў XXVII з'езду КПБ.





Камуністычная партыя Заходняй Беларусі. 1. Дэлегаты II з'езду КПЗБ. Злева направа ў 1-м радзе: А. І. Федасюк, Л. Ф. Сташэўская, Г. А. Крэйн, В. С. Казёл (Селівонік), С. Н. Гоцка, М. І. Русецкая (Крупнік), А. К. Шчасная; у 2-м радзе: Е. Рынг, І. К. Лагіновіч (П. Корчык), Б. Бранкоўскі, В. Г. Кнорын, Ф. Гжэльшчак, В. Каларaў, Ю. Ленскі, С. Бужынскі, С. Генрыкоўскі, М. А. Блінчыкаў; у 3-м радзе: М. А. Цыгельніцкі, А. Раф, Р. Замброўскі, М. М. Дворнікаў, М. С. Арэхва, І. Ф. Сяменікаў, Л. М. Янкоўская, Р. Д. Вольф, В. Жытлоўскі, Б. Берман, М. І. Матысік, М. С. Майскі, Х. І. Левіна, Д. І. Розенштэйн; стаяць Г. Мушкат, С. М. Мальконо, В. Я. Тэвес, Я. Г. Бонк, Ц. І. Гурвіч, А. Я. Багданаў, Э. К. Аболіна, З. Зімнах, С. Г. Розенштэйн, Х. Левін, Ш. Я. Белагурскі, Ю. І. Кавалеўскі, Х. Р. Гелер, С. А. Дзеніс, Н. Зандар (Пясецкі), М. Я. Слопак, В. І. Казлоўскі, М. П. Маслоўскі, І. Я. Дабрыян, Б. Шаршнеўскі.
2. Палітвязні, вызваленыя з беластоцкай турмы ў верасні 1939.
3. Першамайская дэманстрацыя ў Грудку Беластоцкага пав. 1936.



2



3

абслугоўванне насельніцтва. Нац. даход павялічыўся больш чым у 1,5 раза, рэальныя даходы на душу насельніцтва — на 37%. Уведзены 5-дзённы рабочы тыдзень з 2 выхаднымі днямі для рабочых і служачых, гарантаваная грашовая аплата, пенсійнае забеспячэнне і сац. страхаванне калгаснікаў. КПБ выраслa колькасна, загартавалася ідэйна, умацавалася арганізацыйна. Палепшылася расстаноўка парт. сіл на галоўных участках вытворчасці. Сярод прынятых у партыю павялічылася ўдз. в. рабочых, якія складаюць у КПБ 39,1%. Выраслa актыўнасць пярвічных, цэхавых арг-цый і парт. груп, іх роля ў барацьбе за выкананне гасп.-паліт. задач. Павысіўся ўзровень парт. кіраўніцтва Саветамі, прафсаюзнымі, камсамольскімі і інш. грамадскімі арг-цыямі. Больш эфектыўнай стала ідэалаг. работа КПБ. З'езд абавязаў ЦК КПБ, Савет Міністраў БССР, абкомы, гаркомы, райкомы партыі і пярвічныя парт. арг-цыі, сав., гасп. і прафс. органы сканцэнтраваць гал. ўвагу на паскарэнні навук.-тэхн. прагрэсу, паглыбленні і інтэнсіфікацыі вытв., павышэнні прадукцыйнасці працы, зніжэнні сабекошту прадукцыі, удасканаленні метадаў планавання і кіраўніцтва нар. гасп., росце вытв. прадукцыі земляробства і жывёлагадоўлі. З'езд даручыў ЦК КПБ, Савету Міністраў БССР на аснове Дырэктыў XXIV з'езду КПСС распрацаваць план развіцця народнай гаспадаркі рэспублікі на 1971—75.

XXVII з'езд КПБ выбраў ЦК (135 чл. і 63 канд. ў чл. ЦК) і Рэвіз. камісію (41 чл.). На пленуме ЦК КПБ, які адбыўся 24.2.1971, выбрана Бюро ЦК КПБ: чл. Ц. Я. Кісялёў, Л. Г. Кляцкоў, А. Т. Кузьмін, У. Е. Лабанок, П. М. Машэраў, У. Ф. Міцкевіч, І. Я. Палякоў, М. Н. Полазаў, С. В. Прытыцкі, А. А. Смірноў, Ф. А. Сурганаў; канд. І. М. Трацяк, У. І. Падрэз. Першым сакратаром ЦК КПБ выбраны П. М. Машэраў, другім сакратаром Ф. А. Сурганаў, сакратарамі ЦК КПБ А. Т. Кузьмін, У. Ф. Міцкевіч, А. А. Смірноў, старшынёй Рэвіз. камісіі выбраны І. М. Макараў. Пленум ЦК КПБ 16.7.1971 у сувязі з выбраннем Ф. А. Сурганава старшынёй Прэзідыума Вярх. Савета БССР вызваліў яго ад абавязкаў другога сакратара ЦК КПБ. Другім сакратаром і чл. Бюро ЦК КПБ выбраны А. Н. Аксёнаў; канд. ў чл. Бюро ЦК КПБ выбраны М. І. Лагір і Я. П. Нікулкін.

Знамянальнай падзеяй у жыцці партыі і сав. народа, усяго прагрэсіўнага чалавецтва з'явіўся XXIV з'езд КПСС (30.3—9.4.1971). Ён ухваліў паліт. лінію і практычную дзейнасць ЦК, распрацаваў гал. праблемы эканам. і сацыяльна-паліт. развіцця сав. грамадства. З'езд вызначыў праграму далейшага ўмацавання згуртаванасці і магутнасці краін сацыялізма, адзінства камуніст. і рабочых партый, усіх антыімперыял. сіл; пацвердзіў правільнасць сав. знешняй палітыкі, мэта якой — забяспечыць разам з інш. сацыяліст. краінамі спрыяльныя міжнар. ўмовы для пабудовы сацыялізма і камунізма. З'езд прыняў Дырэктывы па 9-м пяцігадовым плане развіцця нар. гасп. СССР на 1971—75, які з'яўляецца важным этапам у стварэнні мат.-тэхн. базы камунізма, умацаванні эканам. і абароннага патэнцыялу краіны, выбраў цэнтр. органы партыі. Генеральным сакратаром ЦК КПСС выбраны Л. І. Брэжнеў. КПБ і ўвесь бел. народ з велізарным за-



Уручэнне Мінскаму трактарнаму заводу ордэна Кастрычніцкай Рэвалюцыі. Злева направа: П. М. Машэраў, М. М. Слюнькоў, Р. К. Прусава, сакратар парткома завода К. М. Каратай. 1971.

давальненнем успрынялі гістар. рашэнні XXIV з'езду КПСС і з натхненнем узяліся за іх ажыццяўленне.

На ўсіх этапах барацьбы за ідэалы камунізма КПБ паслядоўна праводзіць у жыццё генеральную лінію партыі, беражэ вернасць непераможнаму сцягу вялікага Леніна. У прывітальным пісьме ЦК КПСС, Прэзідыума Вярх. Савета СССР, Савета Міністраў СССР у сувязі з 50-годдзем БССР і Кампартыі Беларусі адзначалася: «На чале з партыйнай арганізацыяй рэспублікі працоўныя Беларусі ўпісалі шмат яркіх старонак у гісторыю стварэння і ўмацавання Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, у будаўніцтва сацыялістычнай індустрыі і калектыўнай сельскай гаспадаркі, у ажыццяўленне культурнай рэвалюцыі». Беларусь за гады Сав. улады воляй партыі камуністаў, творчай энергіяй рабочых, калгаснікаў, інтэлігенцыі ўзнялася ад адсталасці да вяршынь грамадска-паліт., эканам. і духоўнага прагрэсу. Яна зрабіла гіганцкі скачок у развіцці прадукц. сіл, навукі і культуры, ва ўздыме нар. дабрабыту. У рэспубліцы створана сучасная цяжкая індустрыя, узніклі новыя галіны прамысл.— аўтамабільная, трактарная, радыёэлектронная, дакладнага прыладабудавання, хімічная, нафтаздабыўная і нафтаперапрацоўчая. Пабудаваны велічныя арх. ансамблі ў старажытных, але па сутнасці народжаных нанава Мінску, Гомелі, Гродне, Магілёве, Брэсце, Віцебску, выраслі новыя гарады — Наваполацк, Салігорск, Жодзіна, Светлагорск, Белаазёрск. Цяпер за няпоўныя пяць дзён прамысловасць Беларусі выпускае столькі прадукцыі, колькі яна давала ў дарэвалюц. час за цэлы год.

Высокаразвітай галіной сацыяліст. вытворчасці стала с. гасп. Усе калгасы і саўгасы электрыфікаваны. З кожным годам паляпшаецца матэрыяльны дабрабыт і культ.-быт. абслугоўванне працоўных рэспублікі. Амаль 3 млн. чал. вучацца. Па колькасці студэнтаў БССР перавысіла ўсю дарэвалюц. Расію, а ў разліку на 10 тыс. чал. насельніцтва намнога апярэдзіла найбольш развітыя капіталіст. краіны. У Беларусі цяпер працуе больш за 500 тыс. дыпламаваных спецыялістаў. Лепшыя творы бел. прозы, паэзіі, драматургіі, музыкі, кінематаграфіі, жывапісу і скульптуры знай-



Работніцы цэха № 9 Брэсцкага электрамеханічнага завода абмяркоўваюць матэрыялы XXIV з'езду КПСС. 1971.

шлі дарогу да сэрцаў мільёнаў людзей. Працоўныя і ратныя подзвігі бел. народа адзначаны высокімі ўзнагародамі Радзімы — 2 ордэнамі Леніна і ордэнам Кастр. Рэвалюцыі. Ордэнамі ўзнаг. ўсе вобласці, некалькі гарадоў, многія прадпрыемствы, калгасы, саўгасы, навук. і навуч. ўстановы, праектныя і канструктарскія арг-цыі, установы культуры Беларусі. У сваім выступленні на ўрачыстасцях паўвекавога юбілею БССР і КПБ Генеральны сакратар ЦК КПСС Л. І. Брэжнеў сказаў: «Камуністы ішлі і ідуць на чале ўсіх слаўных спраў Беларусі, як і ўсёй нашай краіны. Іменна яны з'явіліся той сілай, якая ўзнімала і вяла працоўных рэспублікі на працоўныя і ратныя подзвігі, на самаадданую барацьбу за перамогу ідэалаў камунізма. З усіх выпрабаванняў, а іх нямала выпала на долю беларускіх камуністаў, яны выходзілі яшчэ больш узмацнелыя і загартаваныя. Кампартыя Беларусі — гэта адзін з буйных і баявых атрадаў КПСС, надзейная апора яе ленінскага Цэнтральнага Камітэта».

На 1.1.1972 у КПБ налічвалася 448 574 чал., у т. л. 431 865 чл. і 16 709 канд. у чл. партыі, аб'яднаных у 12 593 пярвічныя парт. арг-цыі, было 6 абкомаў, 18 гаркомаў, 132 райкомы КПБ і 5 парткомаў на правах райкомаў. Друкаваныя органы Цэнтральнага Камітэта КПБ — тэарэт. і паліт. час. *«Коммунист Белоруссии»*, «Политинформатор и агитатор», газ. *«Звязда»*, *«Советская Белоруссия»*, *«Сельская газета»*.

Гл. таксама *Камуністычная партыя Савецкага Саюза*, *Марксізм-ленінізм*, *Камунізм*, *Бальшавізм*, *Праграма Камуністычнай партыі Савецкага Саюза*, *Статут Камуністычнай партыі Савецкага Саюза*, *Цэнтральнае Бюро КП(б)Б*, *Цэнтральны Камітэт КПБ*, *Цэнтральная кантрольная камісія КП(б)Б*, *Рэвізійная камісія КПБ*, *Сакратарыят ЦК КПБ*, *Прэзідыум ЦК КПБ*, *Бюро ЦК КПБ*, *Бальшавіцкі друк*, *Брэсцкая абласная партыйная арганізацыя*, *Віцебская абласная партыйная арганізацыя*, *Гомельская абласная партыйная арганізацыя*, *Гродзенская абласная партыйная арганізацыя*, *Магілёўская абласная партыйная арганізацыя*, *Мінская абласная партыйная арганізацыя*. (Ілюстрацыі гл. таксама на ўклейках I—III.)

Урачыстае пасяджэнне ЦК КПБ і Вярхоўнага Савета БССР, прысвечанае 50-годдзю БССР і КПБ. З прамовай выступае Л. І. Брэжнеў. 1968.





Даты і месца з'ездаў, канферэнцый		Колькасны склад Кампартыі Беларусі
I з'езд КП(б)Б, Смаленск	30—31.12.1918	17 771 чл. партыі
II з'езд КП(б)Б, Вільня	4—6.3.1919	17 636 чл. партыі
III з'езд КП(б)Б, Мінск	22—25.11.1920	2554 чл. партыі
IV з'езд КП(б)Б, Мінск	25.2—2.3.1921	3000 чл. партыі
V з'езд КП(б)Б, Мінск	15—20.10.1921	2925 чл. партыі
VI з'езд КП(б)Б, Мінск	15—19.3.1922	5150 чл. і канд. у чл. партыі
VII з'езд КП(б)Б, Мінск	20—26.3.1923	3850 чл. і канд. у чл. партыі
VIII з'езд КП(б)Б, Мінск	12—14.5.1924	13 975 чл. і канд. у чл. партыі
IX з'езд КП(б)Б, Мінск	8—12.12.1925	15 075 чл. і канд. у чл. партыі
X з'езд КП(б)Б, Мінск	3—10.1.1927	30 995 чл. і канд. у чл. партыі
XI з'езд КП(б)Б, Мінск	22—29.11.1927	35 127 чл. і канд. у чл. партыі
XII з'езд КП(б)Б, Мінск	5—16.2.1929	41 207 чл. і канд. у чл. партыі
XIII з'езд КП(б)Б, Мінск	30.5—12.6.1930	39 256 чл. і канд. у чл. партыі
XIV з'езд КП(б)Б, Мінск	23—29.1.1932	75 238 чл. і канд. у чл. партыі
XV з'езд КП(б)Б, Мінск	16—22.1.1934	65 119 чл. і канд. у чл. партыі
XVI з'езд КП(б)Б, Мінск	10—19.6.1937	47 000 чл. і канд. у чл. партыі
XVII з'езд КП(б)Б, Мінск	10—18.6.1938	31 526 чл. і канд. у чл. партыі
XVIII з'езд КП(б)Б, Мінск	15—20.5.1940	59 853 чл. і канд. у чл. партыі
XIX з'езд КП(б)Б, Мінск	15—18.2.1949	110 110 чл. і канд. у чл. партыі
XX з'езд КП(б)Б, Мінск	20—23.9.1952	127 987 чл. і канд. у чл. партыі
XXI з'езд КПБ, Мінск	10—13.2.1954	129 585 чл. і канд. у чл. партыі
XXII з'езд КПБ, Мінск	22—24.1.1956	145 069 чл. і канд. у чл. партыі
XXIII з'езд КПБ, Мінск	14—15.1.1959	187 909 чл. і канд. у чл. партыі
XXIV з'езд КПБ, Мінск	17—19.2.1960	203 447 чл. і канд. у чл. партыі
XXV з'езд КПБ, Мінск	26—28.9.1961	240 353 чл. і канд. у чл. партыі
XXVI з'езд КПБ, Мінск	3—5.3.1966	343 000 чл. і канд. у чл. партыі
XXVII з'езд КПБ, Мінск	22—24.2.1971	434 527 чл. і канд. у чл. партыі

Літ.: История Коммунистической партии Советского Союза, в шести томах, т. 1—5. М., 1964—70; КП(б)В у рэзалюцыях, ч. 1 (1903—1921), Мн., 1934; Хроника важнейших событий истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 1—2, Мн., 1962—70; Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 1, 2 изд., Мн., 1968, ч. 2, Мн., 1967; Революционное движение в Белоруссии 1905—1907 гг. Документы и материалы, Мн., 1955; Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Документы и материалы, т. 1—2, Мн., 1957; Переписка Секретариата ЦК РСДРП(б) с местными партийными организациями. Сб. документов, т. 1—2, М., 1957; Борьба за Советскую власть в Белоруссии. 1918—1920 гг. Сб. документов и материалов, т. 1—2, Мн., 1968—71; Из истории установления Советской власти в Белоруссии и образования БССР, Мн., 1954 (Документы и материалы по истории Белоруссии, т. 4); Революционные комитеты БССР (ноябрь 1918 г.— июль 1920 г.). Сб. документов и материалов, Мн., 1961; Революционные комитеты БССР и их деятельность по упрочению Советской власти и организации социалистического строительства (июль — декабрь 1920 г.). Сб. документов и материалов, Мн., 1957; Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944). Документы и материалы, т. 1, Мн., 1967; О партийном подполье в Минске в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944 гг.), Мн., 1961; У истоков партии. Материалы научной конференции, посвященной 70-летию I съезда РСДРП, Мн., 1969; Дыренок Е. Д. Полесская организация большевиков в борьбе против царизма, Мн., 1965; Солошенко В. И. Из истории распространения марксизма в Белоруссии (1883—1904 гг.), Мн., 1963; Ляго ж. От народничества к марксизму, Мн., 1971; Бугаев Е. И. Возникновение большевистских организаций и образование Компартии Белоруссии, М., 1959; Лфрэмава О. І. Барацьба за перамогу марксісцкіх ідэй у рабочым руху Беларусі (1907—1914 гг.), Мн., 1962; Бальшавікі Беларусі ў першай рускай рэвалюцыі, Мн., 1955; Воранава А. І. Рабочы рух у Беларусі напярэдадні і ў перыяд рэвалюцыі 1905—1907 гг., Мн., 1960; Шабуня К. И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905—1907 гг., Мн., 1962; Кузняев А. А. На пути к Октябрю, Мн., 1970; Солодков Т. Е. Борьба трудящихся Белоруссии против царизма (1907—1917), Мн., 1967; Ляго ж. Бальшавікі Беларусі ў перыяд першай сусветнай вайны і другой рускай рэвалюцыі (1914 — сакавік 1917 гг.), Мн., 1957; В борьбе за Октябрь в Белоруссии и на Западном фронте, Мн., 1957; Победа Советской власти в Белоруссии, Мн., 1967; Саладков И. И. Большевики Белоруссии в период подготовки и проведения Великой Октябрьской социалистической революции (март 1917 — февраль 1918), Мн., 1957; Игнатенко И. М. Беднейшее крестьянство — союзник пролетариата в борьбе за победу Октябрьской революции в Белоруссии (1917—1918 гг.), Мн., 1962; Зярніцкі М. С. Газета «Звязда» ў барацьбе за перамогу Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Беларусі, Мн., 1957; Почанин С. З. В грозовом восемнадцатом. Большевистские организации Белоруссии в борьбе за власть Советов в 1918 году, Мн., 1969; Каменская Н. В. Белорусский народ в борьбе за Советскую власть (1919—1920 гг.), Мн., 1963; Малашко А. М. К вопросу об оформлении однопартийной системы в СССР, Мн., 1969; Жмуровский Д. П. Организаторская работа Коммунистической партии в деревне (1918—1920 гг.), Мн., 1970; Шкляр Е. Н. Борьба трудящихся Литовско-Белорусской ССР с иностранными интервентами и внутренней контрреволюцией (1919—1920 гг.), Мн., 1962; Шкляр М. Е. Борьба Компартии Белоруссии за укрепление союза рабочего класса и трудящегося крестьянства в восстановительный период (1921—1925 гг.), Мн., 1960; Волохович Л. И. Партийное строительство в Белоруссии в первые годы нэпа (1921—1924 гг.), Мн., 1962; Маркиянов В. К. Укрепление единства рядов Коммунистической партии Белоруссии (1921—1937 гг.), Мн., 1970; Злотник М. И. Деятельность органов партийно-государственного контроля БССР в государственном строительстве (1917—1934 гг.), Мн., 1969; Филимонов А. А. Укрепление союза рабочего класса и трудящегося крестьянства в период развернутого строительства социализма (1929—1936 гг.), Мн., 1968; Герман К. К. Ведущая роль рабочего класса в создании колхозного строя в Белоруссии (1926—1935 гг.), Мн., 1968; Силиванчик П. П. Деятельность Коммунистической партии Белоруссии по осуществлению культурной революции в республике (1919—1937 гг.), Мн., 1961; Етыльнин А. Т. В борьбе за индустриализацию, Мн., 1970; Лагун С. Р. Укрепление Советов Белоруссии и повышение их роли в строительстве социализма, Мн., 1970; Ковалев И. А. Идеологическая работа КПБ в период создания фундамента социализма, Мн., 1970; Власенко Н. В. Борьба Компартии Белоруссии за построение экономического фундамента социализма 1926—1932 гг., Мн., 1970; Революционный путь Компартии Западной Белоруссии, Мн., 1966; Мацко А. Н. Борьба трудящихся Польши и Западной Белоруссии против фашизма (1933—1939 гг.), Мн., 1963; В единой семье советских народов. Материалы Республиканской межвузовской научной конференции, посвященной 30-летию воссоединения белорусского народа в единое советское социалистическое государ-

ство, Мн., 1970; Линило П. П. КПБ — организатор и руководитель партизанского движения в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны, Мн., 1959; Краўчанка І. С. Работа Кампартыі Беларусі ў тылу ворага (1941—1944 гг.), Мн., 1959; Калинин П. З. Партизанская республика, 2 изд., Мн., 1968; Непокоренная Белоруссия, 2 изд., М., 1963; Мацюшэнка Р. Д. Камуністычная партыя Беларусі ў барацьбе за аднаўленне і развіццё прамысловасці ў пасляваенныя гады (1946—1950), Мн., 1962; Деятельность Компартии Белоруссии в период социалистического и коммунистического строительства. Сб. науч. ст., Мн., 1969; Журов А. Е. Под руководством партии. Деятельность КПБ по созданию и руководству комсомолом Белоруссии. 1917—1925 гг., Мн., 1970; Марцелев С. В. Печать Советской Белоруссии, Мн., 1967; Очерки истории профсоюзов Белоруссии, Мн., 1970; Гісторыя Камуністычнай партыі Беларусі. Рэкамендацыйны паказальнік літаратуры, Мн., 1968.

М. Ф. Капіч, І. А. Сяргееў. Мінск.

КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ БРАЗІЛІІ, гл. *Бразільская камуністычная партыя.*

КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ ВЕНГРЫІ, гл. ў арт. *Венгерская сацыялістычная рабочая партыя.*

КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ ВЯЛІКАБРЫТАНІІ (КПВ), засн. на ўстаноўчым з'ездзе 31 ліп.— 1 жн. 1920 у выніку аб'яднання большасці арг-цый Брытанскай сацыяліст. партыі, сацыяліст. арг-цыі Паўд. Уэльса, левых сацыялістаў з Сацыяліст. рабочай партыі і некат. мясцовых сацыяліст. груп. У 1920 далучылася да Камінтэрна. У студз. 1921 у КПВ уліліся прадстаўнікі рэвалюц. руху фабрычна-заводскіх старастаў на чале з У. *Галахерам* і левае крыло Незалежнай рабочай партыі.

Камуністы выступалі ў авангардзе руху *«Рукі прэч ад Расіі»* і ў Саветах дзеяння, якім належала вялікая роля ў зрыве планаў антысав. інтэрвенцыі. Пад уплывам КПВ у прафсаюзах склаўся «рух меншасці», што выступаў супраць палітыкі класавага супрацоўніцтва, якую праводзіла прафсаюзнае і лейбарыстскае кіраўніцтва. На вопыце ўсеагульнай забастоўкі 1926 КПВ павяла актыўную барацьбу за ідэйнае і арганіз. ўмацаванне сваіх радоў, за пашырэнне ўплыву на масы. На XI з'ездзе (1929) ген. сакратаром КПВ выбраны Г. *Політ.* У 30-я гады КПВ адыграла значную ролю ў барацьбе супраць росту фаш. небяспекі ў краіне, выступала за стварэнне сістэмы калект. бяспекі ў Еўропе, разгарнула рух за дапамогу рэсп. Іспаніі, асудзіла Мюнхенскае пагадненне ўрада Вялікабрытаніі з фаш. ўрадамі Германіі і Італіі, патрабавала вызвалення народаў калоній Брыт. імперыі. З пачаткам 2-й сусв. вайны КПВ патрабавала актыўных ваен. дзеянняў супраць фаш. Германіі, а з уступленнем у вайну СССР — хутчэйшага адкрыцця другога фронту ў Еўропе. За гады вайны вырас уплыў КПВ на масы, колькасць чл. павялічылася да 60 тыс. Рост рэфармісцкіх ілюзій сярод працоўных у пасляваенны перыяд часова паслабіў пазіцыі КПВ, але ў 50-я гады ўплыў партыі зноў павялічваецца.

XXII з'езд КПВ (1952) прыняў новую праграму партыі «Шлях Брытаніі да сацыялізма», якая была дапрацавана і дапоўнена на наступных з'ездах. Праграма арыентуе на мірнае развіццё рэвалюцыі спалучэннем масавых паліт. дзеянняў з заваёвай большасці ў парламенце, але не выключае і прымянення сілы, калі буржуазія пяройдзе да насілля. Партыя патрабуе забароны ядзернай зброі, выйсця Вялікабрытаніі з агрэс. ваен. блокаў, выступае за палітыку мірнага суіснавання з інш. краінамі. XXV з'езд (1957) разграміў групу рэвізіяністаў, якія спрабавалі прынізіць ролю партыі. XXVI з'езд (1959) прыняў новы статут партыі. КПВ змагаецца за шырокі саюз левых сіл, падтрымала з гэтай мэтаю як аснову для адзіных дзеянняў «Сацыялістычную хартыю», абвешчаную групай левых лейбарыстаў (1968). XXXI з'езд (1969) адзначыў поспехі ў яднанні левых сіл і паставіў задачу змагацца за далейшы зрух улева ў рабочым руху, за аб'яднанне руху моладзі і розных прагрэс. сіл з рабочым рухам пры кіруючай ролі рабочага класа. КПВ удзельнічала ў міжнар. Нарадах камуніст. і рабочых партый 1957, 1960, 1969 у Маскве. Будуецца паводле прынцыпаў дэмакр. цэнтралізму. 30 607 чл. (1969). Старшыня КПВ А. Суон, ген. сакратар Дж. *Голан.* Цэнтр. орган КПВ штотыднёвы час. «Comment» («Каментарый»). КПВ выдае штодзённую газ. «Morning Star» («Заранка»).

Літ.: Голлан Д. Коммунисты Великобритании в борьбе за социализм, пер. с англ., М., 1968; Акимкина Н. А. Компартия Великобритании в борьбе за массы, Ростов-на-Дону, 1970.

Л. М. Шнеерсон. Мінск.

КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ ГЕРМАНІІ (КПГ), засн. на Устаноўчым з'ездзе 31.12. 1918—1.1.1919 у Берліне ва ўмовах класавых баёў у Германіі, якія ўзмацніліся пад уздзеяннем перамогі Вял. Кастр. сацыяліст. рэвалюцыі. З'езд скліканы «Саюзам Спартака» (гл. *«Спартака Саюз»*). КПГ — адна з заснавальніц Камінтэрна (1919).

З першых дзён існавання КПГ сутыкнулася з контррэвалюц. тэрорам. 15.1.1919 па-зверску забіты кіраўнікі КПГ К. *Лібкнехт* і Р. *Люксембург.* Партыя пайшла ў падполле і прадаўжала мужную барацьбу за дэмакр. правы і свабоды працоўных. У снеж. 1920 у КПГ увайшло левае крыло Незалежнай с.-д. партыі Германіі на чале з Э. *Тэльманам.* У 1923 КПГ узначальвала рух за стварэнне рабочых урадаў у Саксоніі, Цюрынгіі, кіравала паўстаннем гамбургскага пралетарыяту (гл. *Гамбургскае паўстанне 1923*). Аднак праваапартуністычная лінія групы Брандлера — Тальгеймера, што кіравала КПГ, а таксама ультралевыя настроі ў партыі перашкодзілі паспяхова выкарыстаць рэвалюц. сітуацыю восені 1923 для таго, каб скінуць уладу манаполій. У 1924 да кіраўніцтва КПГ прыйшла група «ультралевых» на чале з Р. Фішэр і А. Маславым, якая сектанцкай дзейнасцю падарвала ўплыў партыі ў масах. У 1925 з дапамогай Камінтэрна марксісцка-ленінскае ядро КПГ адкінула прэч «ультралевых». Новы склад ЦК узначаліў Э. Тэльман. КПГ праводзіла актыўную барацьбу за нац. і сацыяльнае вызваленне герм. народа, за адзінства рабочага класа, супраць пагрозы фаш. дыктатуры. У 1932 партыя налічвала 300 тыс. чл., на выбарах у рэйхстаг за яе галасавала амаль 6 млн. чал. Аднак з-за супраціўлення правых с.-д. лідэраў КПГ не змагла пераадолець расколу рабочага класа і спыніць наступленне фашызму. З устанаўленнем фаш. дыктатуры (30.1.1933) КПГ падпала пад крывавы тэрор. З сак. 1933 арыштаваны Э. Тэльман. КПГ перайшла на нелегальнае становішча. Брусельская канферэнцыя КПГ (кастр. 1935), выходзячы з рашэнняў VII кангрэсу Камінтэрна, паставіла за мэту стварыць у Германіі адзіны антыфаш. фронт. Бернская канферэнцыя КПГ (30.1—1.2.1939) вызначыла палітыку партыі ў сувязі з непасрэднай пагрозай узнікнення сусв. вайны, выпрацавала праграму шырокага аб'яднання працоўнікаў фаш. рэжыму.

З пачаткам 2-й сусв. вайны КПГ заклікала ням. народ да барацьбы супраць вайны, за звяржэнне фаш. рэжыму. Пасля нападу фаш. Германіі на СССР КПГ стварыла ў Германіі разам з с.-д. рабочымі падпольныя групы супраціўлення. Па ініцыятыве КПГ у 1943 на

тэр. СССР быў створаны Нац. камітэт «Свабодная Германія», які ўзначаліў барацьбу ням. антыфашыстаў у Германіі, за мяжой і сярод ваеннапалонных. Пасля разгрому фашызму КПГ абвясціла праграму антыфашысцкадэмакр. пераўтварэнняў і стварэння міралюбнай незалежнай дэмакр. Германіі. На аснове гэтай праграмы ва Усх. Германіі быў пераадолены раскол рабочага класа. 21—22.4. 1946 у Берліне адбыўся аб'яднаўчы з'езд КПГ і С.-д. партыі Германіі, на якім утворана *Сацыялістычная адзіная партыя Германіі.* У Зах. Германіі правыя лідэры сацыял-дэмакратаў пры падтрымцы акупацыйных улад ЗША, Вялікабрытаніі і Францыі перашкодзілі аб'яднанню партый рабочага класа. Кампартыя ў Зах. Германіі аформілася ў самаст. арг-цыю і захавала ранейшую назву — *Камуністычная партыя Германіі.* КПГ будавалася паводле прынцыпаў дэмакр. цэнтралізму. Друкаваным органам КПГ была газ. «Rote Fahne» («Чырвоны сцяг»).

Літ.: Очерк истории немецкого рабочего движения, М., 1964.

В. І. Розік. Мінск.

КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ ГЕРМАНІІ (КПГ), аформілася як партыя, што дзейнічае ў Зах. Германіі, у крас. 1948, пасля таго, як правыя лідэры с.-д. партыі сарвалі аб'яднанне камуністаў і сацыял-дэмакратаў у адзіную рабочую партыю ў агульнагерманскім маштабе. Партыя прыняла назву заснаванай у 1918 *Камуністычнай партыі Германіі.*

КПГ была адзінай партыяй у Зах. Германіі, якая з самага пачатку змагалася супраць рэстаўрацыі ўлады манаполій, за паляпшэнне эканам. становішча працоўных, супраць палітыкі мілітарызму і рэваншызму, за адзіную міралюбную і дэмакр. Германію. Уплыў яе сярод працоўных няспынна павялічваўся. На выбарах у бундэстаг у жн. 1949 КПГ атрымала больш за 1 млн. 360 тыс. галасоў. КПГ узначаліла рух нар. мас супраць уцягвання ФРГ у агрэсіўны блок НАТО. У ліст. 1954 улады ФРГ арганізавалі судовы працэс над КПГ, які закончыўся 17.8.1956 забаронай КПГ. Але і ў падполлі КПГ актыўна змагаецца супраць мілітарысцкага курсу ваенна-прамысл. манаполій, за стварэнне ў ФРГ сапраўды дэмакр. ладу. Чарговы з'езд КПГ у 1963 прыняў праграмную заяву «Шлях да выратавання міру, да абароны дэмакратычных правоў, да сацыяльнай забяспечанасці», якая мабілізуе антыфаш. і антываен. сілы ў ФРГ на барацьбу за міжнародна-прававое прызнанне ГДР, пасляваен. граніц у Еўропе, за ажыццяўленне палітыкі мірнага суіснавання з сацыяліст. краінамі. У праекце праграмы КПГ (люты 1968) гаворыцца, што КПГ прытрымліваецца прынцыпаў марксізма-ленінізма і пралет. інтэрнацыяналізму, выступае за ажыццяўленне сацыяліст. пераўтварэнняў у краіне. У ФРГ мацнее барацьба за адмену забароны КПГ. Яна асабліва пашырылася пасля ўтварэння легальнай *Германскай камуністычнай партыі.*

КПГ удзельнічала ў міжнар. Нарадах камуністычных і рабочых партый 1957, 1960 і 1969 у Маскве і падпісала прынятыя дакументы.

Літ.: Коммунистическая партия Германии. 1945—1965, М., 1968.

В. І. Розік. Мінск.

КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (КПЗБ), рэвалюцыйная, марксісцка-ленінская партыя, баявы авангард зах.-беларускага пралетарыяту, арганізатар і кіраўнік барацьбы працоўных за сац. і нац. вызваленне. Створана ў кастр. 1923 на канфер. Беластоцкага, Брэсцкага і Віленскага к-таў Камуніст. рабочай партыі Польшчы (КПРП, з люта. 1925 Камуніст. партыі Польшчы — КПП), якія аб'ядноўвалі ў сабе арг-цыі Кампартыі Літвы, што існавалі на іх тэрыторыі (на Віленшчыне) і арг-цыі КП(б)Б, што перайшлі ў падполле пасля захопу Зах. Беларусі бурж. Польшчай (гл. *Першая канферэнцыя КПЗБ*). У канцы снеж. 1923 у КПЗБ уступіла *Беларуская рэвалюцыйная арганізацыя* (БРА). Дзейнічала на правах тэр. аўтаномнай арг-цыі ў складзе КПП. Апрача Зах. Беларусі, працавала ва ўсх. паветах Беластоцкага ваяводства, на тэр. ўсх. Літвы (Вільна, Віленска-Троскі, Свянцянскі пав.), акупаванай у кастр. 1920 бурж. Польшчай, у Камень-Кашырскім і Сарненскім пав. Зах. Украіны. КПЗБ працавала пад кіраўніцтвам КПП, поўнасцю падзяляла яе праграму і статут. Як і ўся КПП, яна змагалася за перамогу пралет. рэвалюцыі ў Польшчы, за ліквідацыю памешчыцкага землеўладання і перадачу сялянам аямлі без выкупу, за права самавызначэння *Заходняй Беларусі* аж да аддзялення ад Польшчы і ўз'яднання з БССР. КПЗБ узначальвала рэвалюц. барацьбу рабочых, сялян і інтэлігенцыі, абараняла іх інтарэсы, змагалася супраць акупац. рэжыму, устаноўленага бурж. урадам Польшчы ў Зах. Беларусі, прапагандавала дасягненні сав. народа ў сацыяліст. буд-ве, змагалася супраць антысав. знешняй палітыкі польск. бурж. ўрада, выступала ў абарону СССР і БССР. КПЗБ на вопыце ВКП(б) і КП(б)Б настойліва авалодвала бальшавізмам, ленінскімі арганіз. і ідэалаг. прынцыпамі, стратэгіяй і тактыкай, выхоўвала рабочых і сялян у духу пралет. інтэрнацыяналізму. У яе радах за сац. і нац. вызваленне поплеч змагаліся беларусы, палякі, украінцы, літоўцы, яўрэі.

КПЗБ дзейнічала нелегальна ва ўмовах капіталіст. ладу, акупац. рэжыму і фаш. тэрору дыктатуры пілсудчыкаў, улады праследавалі яе членаў, знявольвалі ў турмы, наладжвалі масавыя працэсы (*гл. Працэс 94-х, Працэс 56-і, Працэс 133-х, Працэс 35-і, Працэс 75-і*), высылалі ў адм. парадку ў *Бяроза-Картузскі канцэнтрацыйны лагер.* КПЗБ змагалася супраць рэакцыйных бурж., у т. л. бел. бурж.-нацыяналіст., партый і іх арг-цый: *Беларускі сялянскі саюз* (БСС), *Беларуская хрысціянская дэмакратыя* (БХД), *Цэнтральны саюз культурных і гаспадарчых арганізацый* (Беларуская санацыя), а таксама супраць правых лідэраў рэфармісцкіх партый — ППС, «Строніцтва людовае», Бунду, якія імкнуліся аслабіць рэвалюцыйную барацьбу працоўных.

Цесна звязаная з масамі, КПЗБ пастаянна расла за лік перадавых рабочых і сялян, умацоўвалася арганізацыйна. На час стварэння ў КПЗБ было каля 500 чл., у канцы 1924 — 2200, у 1925 — 2800, у 1933 — 3800—4000 чл. Апрача таго, больш за 3000 чл. КПЗБ пастаянна знаходзілася ў турмах. Агульная колькасць чл. КПЗБ перавышала 7 тыс. У 1924—29 існавала 6 акруговых (Беластоцкі, Брэсцкі, Віленскі, Гродзенскі, Слонімска-Баранавіцкі, Пінскі) і больш за 50 раённых к-таў КПЗБ; у 30-я г.— 11 акруговых (дадаткова Навагрудскі, Лідскі, Маладзечанскі, Свянцянска-Браслаўскі, Глыбоцка-Пастаўскі), больш за 90 раённых к-таў. За час дзейнасці КПЗБ адбылося 2 з'езды і 3 канфер. (гл. *Першы з'езд КПЗБ, Другі з'езд КПЗБ, Першая канферэнцыя*



Газеты і часопісы, якія выдавала КПЗБ.

КПЗБ, Другая канферэнцыя КПЗБ, Трэцяя канферэнцыя КПЗБ). Перыядычна адбываліся пленумы ЦК КПЗБ.

Работу КПЗБ узначальваў *Цэнтральны Камітэт КПЗБ*. Пленум ЦК КПЗБ складаўся з Бюро ЦК і Краявога сакратарыяту. Бюро ЦК (4—5 чал., для бяспекі знаходзілася пераважна ў Гданску) займалася агульнапаліт. пытаннямі, кіравала Краявым сакратарыятам, рэдагавала час. «Бальшавік», падтрымлівала сувязь з Палітбюро ЦК КПП і з ЦК КП(б)Б праз прадстаўніка, чл. Бюро ў Мінску. Краявы сакратарыят (3—4 чал. на чале з чл. Бюро, размяшчаўся гал. ч. у Варшаве, Вільні, Беластоку) кіраваў акруговымі к-тамі КПЗБ, ЦК КСМЗБ, ЦК МОПРа, Цэнтр. тэхнікай (ЦТ), цэнтрамі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, *Літоўскім бюро ЦК КПЗБ* і рэдакцыямі легальных газет рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага характару. ЦТ стварала і трымала падпольныя друкарні, дастаўляла парт. л-ру акруговым к-там; КПЗБ мела падпольныя друкарні ў Вільні (дзве) і ў Беластоку (адна); друкарскія станкі былі і ў інш. гарадах. Цэнтр. орган КПЗБ — газ. *«Чырвоны сцяг»*. З канца 1924 выдаваўся тэарэт. час. ЦК КПЗБ *«Бальшавік»*. У розныя часы ЦК КПЗБ нелегальна выдаваў на бел., польскай, рус., яўр. і літ. мовах газ.: «Do walki» («Да барацьбы», польск.), «Kujmy broń» («Куйце зброю», польск.), «Партработнік», «Бюлетэнь ЦК КПЗБ», «Весткі з СССР», «Голас салдата», «Barikada» («Барыкада», літ.), «Ройтэ фон» («Чырвоны сцяг», яўр.) і інш., а таксама брашуры, лістоўкі, адозвы. Акруговыя і некат. раённыя к-ты КПЗБ нерэгулярна выдавалі газеты і лістоўкі на шапірографах і гектографах. Беластоцкі акр. к-т КПЗБ выдаваў газ. «Włókniarz Białostocki» («Беластоцкі тэкстыльшчык», польск.), Віленскі — «На баррыкады», Навагрудскі — «На акупанта»; Белавежскі райком КПЗБ — «Лесаруб у барацьбе», «Чырвоная Гайнаўка», Воўчынскі — «Наперад», Любчанскі — «Змаганне Навагрудчыны». Рукапісны, машынапісны адозвы выдавалі і некат. ячэйкі КПЗБ. Легальнымі органамі КПЗБ былі газ.: *«Барацьба»*, *«Беларуская газета»*, *«Наша воля»*, сатырычны час. *«Асва»*. Балявым памочнікам КПЗБ быў *Камуністычны саюз моладзі Заходняй Беларусі* (КСМЗБ); пад яе кіраўніцтвам працавала Чырвоная дапамога (МОПР Зах. Беларусі). КПЗБ цесна супрацоўнічала з *Камуністычнай партыяй Заходняй Украіны*. КПЗБ карысталася падтрымкай і дапамогай брацкай КП(б)Б і ўсяе ВКП(б). Пры ЦК КП(б)Б існавала прадстаўніцтва ЦК КПЗБ, якое мела школу парт. работнікаў і рэдакцыю асобных выданняў КПЗБ. У АН БССР працавала камісія па вывучэнні Зах. Беларусі, якая выдавала «Інфармацыйны бюлетэнь аб Заходняй Беларусі» і інш. л-ру пра Зах. Беларусь. У Ін-це гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б існаваў Зах. сектар, які распрацоўваў гісторыю КПЗБ. Парт. і сав. друк, грамадскія арг-цыі БССР жыва адгукаліся на падзеі ў Зах. Беларусі, Польшчы: рэвалюц. выступленні, забастоўкі, судовыя працэсы, галадоўкі паліт. зняволеных — пратэставалі супраць праследаванняў рэвалюцыянераў, нац. ўціску. Поспехі сацыяліст. буд-ва ў СССР, эканам. і культ. росквіт БССР, ленінская нац. палітыка ВКП(б) і КП(б)Б спрыялі дзейнасці КПЗБ і аказвалі рэвалюцыянізуючы ўплыў на працоўных Зах. Беларусі.

Да стварэння КПЗБ барацьба працоўных Зах. Беларусі, асабліва ў вёсцы, мела стыхійны характар, пераважалі ўзбр. партыз. выступленні, якія ў 1923—24 ахапілі большасць паветаў (гл. *Партызанскі рух у Заходняй Беларусі 1921—25*). Пераходзячы ад партыз. барацьбы да паўсядзённай работы ў масах, КПЗБ ставіла задачу ахапіць уплывам

Рукапісны часопіс «Лукішскі сцяг», які выдавалі палітвязні турмы Лукішкі ў Вільні.



большасць рабочага класа, прыдаць арганіз. формы сялянскім рэвалюц. выступленням, умацаваць саюз пралетарыяту з сялянствам, узначаліць нац.-вызв. рух і аб'яднанымі намаганнямі з працоўнымі Польшчы і Зах. Украіны звергнуць панаванне буржуазіі і памешчыкаў. У гэтых умовах у КПЗБ праявіла сябе антыпарт. нацыяналіст. групоўка, т. зв. *сацэсія* (адшчапенцы). Яна выступіла супраць цэнтралізаванай будовы КПП, супраць сумеснай рэвалюц. барацьбы працоўных Зах. Беларусі і Польшчы, імкнулася праводзіць асуджаны КПЗБ курс на адасобленае ўзбр. паўстанне ў Зах. Беларусі. Большасць парт. арг-цый КПЗБ не падтрымала сэцэсію, яе асудзілі ЦК КПЗБ, ЦК КПП, Выканком Камінтэрна. Амаль усе прыхільнікі сэцэсіі прызналі памылкі і вярнуліся ў партыю, асобныя адзіночкі, выключаныя з КПЗБ, перакінуліся да бел. бурж. нацыяналістаў. Ліквідацыя сэцэсіі была арганіз. і ідэалаг. перамогай КПЗБ над небяспекай пранікнення ў партыю нацыяналіст. настрояў і сепаратысцкіх тэндэнцый. З сярэдзіны 20-х г. барацьба рабочых і сялян пад кіраўніцтвам КПЗБ стала больш арганізаваная. Шырокі размах і вострыя формы набыў рэвалюц. рух у гады сусв. эканам. крызісу (1929—33). Камуністы актыўна працавалі ў прафсаюзах (рэвалюц., рэфармісцкіх, хрысціянскіх, нацыяналіст.), імкнуліся аб'яднаць рабочых у адзіныя прафсаюзы на платформе класавай барацьбы. КПЗБ узначальвала амаль усе рэвалюц. выступленні рабочых, сялян, беспрацоўных, у т. л. вял. рэвалюц. выступленні беластоцкіх тэкстыльшчыкаў (1932, 1933), рабочых дрэваапрацоўчай прамысл. і лесараспрацовак Белавежскай пушчы (1932—34). Забастоўкі выліваліся ў бурныя рэвалюц. дэманстрацыі і сутычкі з паліцыяй. У большасці яны скончыліся поўнай ці частковай перамогай рабочых. КПЗБ узначальвала таксама барацьбу сялян за зямлю, супраць падаткаў, шарваркаў, нац. ўціску, за школу на роднай мове, за вызваленне паліт. вязняў. Заклікі КПЗБ «Зямля сялянам без выкупу!», «Не плаціць ні граша падаткаў фашысцкаму ўраду!» знайшлі шырокі водгук на вёсцы. Сяляне адмаўляліся плаціць падаткі, выконваць шарваркі, праганялі каморнікаў, што праводзілі хутарызацыю і ліквідацыю сервітутаў. Балявыя рэвалюц. выступленні сялян адбыліся ў в. Варотнае і Залессе Пружанскага, Баранава Гродзенскага, Ляплёўка Брэсцкага, Асташына Навагрудскага (гл. *Асташынскае выступленне сялян*) пав. і інш. Сяляне в. Навасёлкі, Франапаль, Радванічы і інш. Кобрынскага пав. 3.8.1933 разброілі асаднікаў, напалі на паліцэйскі ўчастак у в. Навасёлкі, уступілі ў перастрэлку з карным атрадам (гл. *Кобрынскае ўзброенае выступленне сялян 1933*). Пад кіраўніцтвам КПЗБ шырокі размах набыў нац.-вызв. рух. Нянавісць да прыгнятальнікаў, імкненне да ўз'яднання Зах. Беларусі з БССР асабліва выявіліся ў 1925—27 у дзейнасці 100-тысячнай рэвалюц.-дэмакратычнай і нац.-вызв. арг-цыі *Беларускай сялянска-рабочай грамады* (БСРГ), у 1928—30 Беларускага сялянска-рабочага пасольскага клуба *«Змаганне»*, якія ўзніклі пад уплывам і дзейнічалі пад кіраўніцтвам КПЗБ, а таксама *Таварыства беларускай школы* (ТБШ). Карыстаючыся легальнасцю гэтых арг-цый, КПЗБ пашырала свой уплыў на масы, накіроўвала нац.-вызв. рух у агульнае рэчышча рэвалюц. барацьбы супраць фаш. дыктатуры і бурж.-памешчыцкага ладу ў Польшчы. КПЗБ умела спалучала і выкарыстоўвала легальныя і нелегальныя формы барацьбы. Сведчанне гэтага — удзел КПЗБ у выбарах у польскі сейм. Нягледзячы на тэрор, у 1928 спіс камуністаў у Зах. Беларусі сабраў больш за 328 тыс. галасоў, ці

Плакат з фотаздымкамі дэпутатаў фракцыі «Змаганне», абітых паліцыяй. Выдадзены КПЗБ у час дадатковых выбараў у сейм у Лідскай і Свянцянскай выбарчых акругах. 1930.





Выданні КПЗБ.

26% выбаршчыкаў. Выконваючы рашэнні VII кангрэсу Камінтэрна, КПЗБ паспяхова змагалася за стварэнне адзінага рабочага і антыфашысцкага народнага фронту. Яна дамагалася адзінства дзеянняў з асобнымі арг-цыямі ППС, «Строніцтва людовага», Бунду, з кіраўніцтвам рэфармісцкіх прафсаюзаў і бел. культ.-асвет. арг-цый. Многатысячныя першамайскія і інш. дэманстрацыі і мітынгі ў Вільні, Беластоку, Гродне, Баранавічах, Ваўкавыску, забастоўка рабочых на Лідскай ф-цы гумавых вырабаў «Ардаль», *нарачанскіх рыбакоў выступленне 1935*, выступленне сялян у Сувалкаўскім пав. і на Палессі праходзілі пад заклікам барацьбы супраць фашызму і вайны, супраць увядзення фаш. канстытуцыі і антыдэмакр. выбарчага закону, за амністыю для паліт. зняволеных (сабрана больш за 100 тыс. подпісаў пад патрабаваннем вызваліць паліт. вязняў), за ліквідацыю канцлагера ў Бярозе-Картузскай, за салідарнасць з рэспубліканскай Іспаніяй, за разрыў саюзу з гітлераўскай Германіяй, за супрацоўніцтва з СССР. Значную ролю ў стварэнні антыфаш. нар. фронту адыграла барацьба ў абарону С. В. Прытыцкага, прыгаворанага да пакарання смерцю. Пад уплывам КПЗБ у Вільні дзейнічала арганізацыя прагрэсіўнай польскай інтэлігенцыі «Студэнцкая лявіца «Фронт (1933—36). Праз газеты «Poprostu» («Папросту») і «Karta» («Карта») яна аказвала моцнае ўздзеянне на нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі. Вялікі ўплыў на гэты рух мела творчасць рэвалюцыйных беларускіх пісьменнікаў членаў КПЗБ М. Танка, П. Пестрака, В. Таўлая, М. Васілька.

Рабочая міліцыя на Першамайскай дэманстрацыі ў Гродне. 1936.



Чл. КПЗБ і ў турмах захоўвалі арганізаванасць, стваралі парт. к-ты, падтрымлівалі сувязь з парт. арг-цыямі на волі, тайна выдавалі рукапісныя часопісы, вялі паліт. работу сярод зняволеных, адзначалі рэвалюц. святы. Пад кіраўніцтвам турэмных парт. к-таў метадам галадовак палітвязні змагаліся супраць фаш. турэмнага рэжыму, за абарону сваіх правоў і чалавечай годнасці. Турмы сталі кузняй загартоўкі кадраў КПЗБ. Многія чл. КПЗБ прабылі ў турмах па 10 і болей гадоў. Сярод іх П. А. Жалезняковіч, Ф. Д. Кавалеўскі, З. Ф. Панлаўскі, С. П. Пацяруха, П. С. Пестрак, Д. І. Розенштэйн, А. Р. Свяргун, Р. І. Сяржант, У. З. Царук, Л. Р. Шайкоўскі і інш. Калля вытокаў утварэння КПЗБ стаялі актыўныя ўдзельнікі Вял. Кастр. рэвалюцыі і грамадз. вайны, выдатныя дзеячы КПП — А. П. Данялюк (Стафанскі), С. А. Дубовік, С. Т. Мілер, С. А. Мертэнс (Скульскі), А. С. Славінскі (Качароўскі). У ліку найб. выдатных дзеячаў КПЗБ: А. А. Альшэўскі, Л. Н. Арэнштам, М. С. Арэхва, Я. С. Бабровіч, М. А. Блінчыкаў, Ю. Брун, С. І. Будзінскі, Р. Д. Вольф, С. К. Гарбуз (Паддубны), Х. Р. Гелер, Г. М. Дуда, Э. А. Ідаль, А. У. Канчэўскі, І. П. Каросас, С. А. Клінцэвіч, П. Корчык (І. К. Лагіновіч), С. М. Малько, Н. Л. Перавалоцкі, Ф. Б. Пірышка, С. В. Прытыцкі, Л. І. Родзевіч, А. М. Розенштэйн (Максімоўскі), І. Ф. Сяменнікаў, В. З. Харужая, Л. М. Янкоўская.

КПЗБ спыніла існаванне ў 1938. КПП была ілжыва абвінавачана ў пранікненні варожай агентуры ў яе кіраўніцтва. У жн. 1938 КПП і яе састаўныя часткі — КПЗБ і КПЗУ — рашэннем Выканкома Камінтэрна распушчаны. Але і пасля роспуску партыі былыя чл. КПЗБ не спынялі рэвалюц. барацьбы. У час *уз'яднання Заходняй Беларусі з БССР* яны складалі ядро рабочай гвардыі, сялянскай міліцыі, памагалі ўстанаўліваць Сав. ўладу. Яны актыўна ўключыліся ў сацыяліст. буд-ва ў зах. абласцях БССР; у Вял. Айч. вайну ўдзельнічалі ў партыз. руху супраць нямфаш. захопнікаў, стваралі *антыфашысцкія арганізацыі*, ваявалі на фронце. КПЗБ і яе актыў рэабілітаваны пасля апублікавання 21.2.1956 у газ. «Правда» заявы Цэнтр. Камітэтаў Камуніст. партый Сав. Саюза, Балгарыі, Фінляндыі, Італіі і Польскай аб'яднанай рабочай партыі, у якой дадзена высокая ацэнка дзейнасці КПП, указана, што роспуск яе неабгрунтаваны, абвінавачанне супраць КПП сфабрыкавана правакатарамі. У жн. 1956 ЦК КПСС прыняў рашэнне аб аднаўленні парт. стажу ўсім членам КПСС, якія раней належалі да КПП, КПЗБ, КПЗУ. (Іл. гл. таксама на ўклейцы.)

Літ.: Революционный путь Компартии Западной Белоруссии, Мн., 1966; История Белорусской ССР, т. 2, Мн., 1961, с. 347—375; Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР. Документы и материалы, т. 1 (1921—1929 гг.), Мн., 1962; У сувровыя гады падполля. Успаміны былых членаў КПЗБ — актыўных удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, Мн., 1958; За правильное освещение истории Компартии Западной Белоруссии, «Коммунист», 1964, № 8; Арэхва М. С. Рэвалюцыйны рух у Заходняй Беларусі ў гады белапольскай акупацыі. Мн., 1958; Мацко А. Н. Борьба трудящихся Польши и Западной Белоруссии против фашизма (1933—1939 гг.), Мн., 1963; Полуян В. А. и Полуян И. В. Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1920—1939 гг., Мн., 1962; Палуян У. А. Беларуская сялянска-рабочая грамада, Мн., 1967; Глинская Т. Ю. КПЗБ в борьбе за завоевание трудящихся масс (1924—1928 гг.), Мн., 1962; Притыцкий С. О. Во имя счастья трудового народа, «Советская Отчизна», 1958, № 6; Мицкевич-Капсукас В. Национально-революционное движение в Западной Белоруссии и разгром Громады, «Коммунистический Интернационал», 1927, № 6; Валевіч І. Р. Першыя гады Кампартыі Заходняй Беларусі. Успаміны падпольшчыка. 1921—1925 гг., Мн., 1935; Падгайскі М. Вялікая барацьба лесарубаў, Вільня, 1934; Крыўда Я. Супраць пацыянальнага ўціску і панскапольскай акупацыі, Вільня, 1932; Багдапскі Я. і Бабровіч Л. Аб класавай барацьбе ў Заходняй Беларусі ў часы Беларускай сялянска-работніцкай грамады, Мн., 1932; Сталевіч А. Заходняя Беларусь — калонія Польшчы, Мн., 1930; Виленюсское подполье. Воспоминания участников революционного движения в Вильнюсском крае (1920—1939 гг.), Вильнюс, 1966; KPP. Uchwały i rezolucje, t. 1—2, Warszawa, 1953—55.

М. С. Арэхва, І. П. Хайратовіч. Мінск.

КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ ЗАХОДНЯЙ УКРАІНЫ (КПЗУ), рэвалюцыйная марксісцкая партыя ў *Заходняй Украіне*, баявы авангард зах.-ўкраінскага пралетарыяту, арганізатар і кіраўнік барацьбы працоўных за сац. і нац. вызваленне, за ўз'яднанне з УССР. Дзейнічала на правах тэрытарыяльнай аўт. арг-цыі ў складзе Кампартыі Польшчы (КПП). Створана ў лютым 1919 на канфер. падпольных камуніст. арг-цый і груп Усх. Галіцыі пад назваю Камуніст. партыя Усх. Галіцыі (КПУГ). У вер. 1919 прынята ў Камуніст. Інтэрнацыянал як асобная секцыя; з 1921 у складзе КПП на правах абл. аўт. арг-цыі. Паводле рашэння II з'езду КПП (1923) дзейнасць КПУГ пашырана на Валынь, Холмшчыну, Паўд. Палессе і Падляшша. Перайменавана ў КПЗУ.

У КПЗУ ў 1919 было 182 чл., у 1936 больш за 4700 чл. Пад яе кіраўніцтвам і ўплывам былі многія прафсаюзныя, прагрэс. сялянскія, маладзёжныя арг-цыі, у т. л. масавая рабоча-сялянская арг-цыя «Сельроб» (1926—32), Камуністычны Саюз Моладзі Зах. Украіны (КСМЗУ) і інш. Супрацоўнічала з *Камуністычнай партыяй Заходняй Беларусі* (КПЗБ). КПЗУ — арганізатар і кіраўнік найб. буйных рэвалюц. выступленняў працоўных Зах. Украіны, у т. л. рабочых лесапільняў Прыкарпацця (1926), барыслаўскіх нафтавікоў (1932), пралетарыяту Львова (1936), сялян-беднякоў (1928—29, 1936). Партыя трывала стаяла на пазіцыях марксізма-ленінізма, выхоўвала працоўных у духу пралет. інтэрнацыяналізму і дружбы народаў, выкрывала контррэвалюц. сутнасць укр. бурж. нацыяналістаў, падтрымлівала рэвалюц. выступленні польскага і міжнар. пралетарыяту. Важнымі вехамі ў гісторыі КПЗУ былі яе з'езды: I — 1921, II — 1925, III — 1928, IV — 1934, на якіх вызначалася тактыка партыі ў рэвалюц. і нац.-вызв. руху, формы кіраўніцтва класавай барацьбой працоўных. Партыя нелегальна і легальна выдавала: час. «Наша правда», «Комуністичний прапор», газ. «Земля і воля», «Світло», «Трибуна робітничa», «До наступу» і інш., лістоўкі, адозвы, брашуры, працы К. Маркса, Ф. Энгельса, У. І. Леніна. Кіруючыя дзеячы КПЗУ: А. Г. Бараль (У. Саўка), С. В. Букатчук, А. Я. *Гаўрылюк*, Я. А. *Галан*, М. Ц. Заячкоўскі (Касар), Р. В. Іваненка (Бараба), В. В. Кацко, І. В. Крылык (Васількаў), Р. В. Кузьма (Турапскі), П. С. Ладан, Р. І. Мыхаць, Г. І. Паўлык, В. Б. Попель, Ф. М. Прыступа, К. А. Саўрыч (Максімовіч), М. Н. Цяслюк, Н. В. Хоміп і інш. У 1938 КПП і яе часткі — КПЗУ і КПЗБ на падставе несправядлівага абвінавачання распушчаны Выканкомам Камінтэрна. Але і пасля роспуску партыі камуністы Зах. Украіны, як і былыя члены КПП і КПЗБ, не спынілі барацьбы, кіравалі рэвалюц. рухам працоўных.

Літ.: Очерки истории Коммунистической партии Украины, 2 изд., Киев, 1964; За правильное освещение истории Коммунистической партии Западной Украины, «Коммунист», 1963, № 10; Комуністична партія Західної України, у кн.: Українська Радянська Енциклопедія, т. 7, Київ, 1962, с. 84—86.

А. М. Мацко. Мінск.

КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ ЗЛУЧАНЫХ ШТАТАЎ АМЕРЫКІ (КП ЗША), засн. ў вер. 1919 ва ўмовах уздыму рэвалюц. руху, які ўзмацніўся пад уплывам Вял. Кастр. сацыяліст. рэвалюцыі. 1—5.9.1919 левае крыло Сацыяліст. партыі на чале з Ч. Рутэнбергам правяло ўстаноўчы з'езд Камуніст. партыі Амерыкі. 31.8—5.9.1919 адбыўся ўстаноўчы з'езд Камуніст. рабочай партыі Амерыкі, праведзены другой групай левых сацыялістаў на чале з Дж. *Рыдам*. Абедзве партыі далучыліся да Камінтэрна. Праследаванні з боку ўрада вымусілі камуністаў перайсці на нелегальнае становішча. У маі 1921 абедзве партыі зліліся ў адзіную Аб'яднаную камуніст. партыю Амерыкі. У снеж. 1921 створана легальная Рабочая партыя Амерыкі, у якую ўвайшла і кампартыя (крас. 1923). На з'ездзе 30.12.1923—1.1.1924 партыя прыняла назву Рабочай (камуністычнай) партыі Амерыкі (у 1930 перайменавана ў КП ЗША).

З першых дзён існавання КП ЗША паслядоўна выступае на абарону жыццёвых інтарэсаў працоўных. Арганізоўвала масавыя кампаніі ў падтрымку Сав. Расіі супраць замежнай інтэрвенцыі, у перыяд сусв. крызісу 1929—33 актыўна ўдзельнічала ў арганізацыі галодных паходаў беспрацоўных, руху збяднелых фермераў. Пры актыўным удзеле камуністаў быў створаны прагрэс. на той перыяд Кангрэс вытворчых прафсаюзаў (1938). Больш за 3 тысячы амер. камуністаў змагаліся ў інтэрнацыянальных брыгадах у абарону Ісп. рэспублікі ў 1936—38. У 2-ю сусв. вайну КП ЗША выступала за ўмацаванне антыгітлераўскай кааліцыі, патрабавала найхутчэй адкрыць 2-і фронт. КП ЗША выстаяла і мужнела ў барацьбе супраць рэвізіянізму і сектанцтва. У 1929 была выкрыта і адкінута група Дж. Лоўстана (на той час ген. сакратара партыі), які прапаведваў тэорыю «класавага супрацоўніцтва». У канцы 2-й сусв. вайны група Э. Браўдэра (быў ген. сакратаром ЦК КП ЗША з 1930) выступіла з тэорыяй аб «прагрэсіўнасці» амер. капіталізму, прапаведвала «класавы мір» і «класавае супрацоўніцтва». На XII з'ездзе (1944) Браўдэр дамогся прыняцця рэзалюцыі аб роспуску кампартыі і замене яе беспартыйнай «Камуністычнай паліт. асацыяцыяй». Асноўная, верная марксізму частка камуністаў на чале з У. *Фостэрам*, Ю. Дэнісам, Г. Холам, Э. Флін, Г. Уінстанам і інш. пры падтрымцы братніх кампартый рашуча выступіла супраць ліквідатараў. XIII надзвычайны з'езд (ліпень 1945) аднавіў КП ЗША.

КП ЗША з першых дзён існавання зазнала ганенні рэакцыі. Неўзабаве пасля 2-й сусв. вайны праследаванне КП ЗША ўзмацнілася. За 1947—56 адбылося 18 судовых працэсаў над кіруючымі работнікамі кампартыі. У 1949 па сфабрыкаванай абвінавачанні ў «падрыўной дзейнасці» былі прыгаворапы на вял. тэрміны зняволення 11 кіраўнікоў КП ЗША. Урад ЗША прыняў шэраг антыкамуніст. законаў, якія потым у канцэнтраваным выглядзе былі выражаны ў законе Хэмфры — Батлера «аб кантролі над камуністычнай дзейнасцю» (1954). Ён пазбаўляў кампартыю правоў па-

літ. арг-цыі. У канцы 50-х — пач. 60-х г. партыя выкрыла і адкінула прэч рэвізіяністычную групу Дж. Гейтса, «ультралевых», а таксама дагматыкаў і сектантаў, дзейнасць якіх зноў вяла да ліквідацыі КП ЗША. У 60-я г. вярхі ЗША ўзмацнілі ганенні на кампартыю. КП ЗША ў мужнай і доўгай барацьбе пры падтрымцы прагрэс. сіл краіны і свету адстаяла сваё права на існаванне як паліт. арг-цыі рабочага класа. КП ЗША заклікае працоўных змагацца супраць манаполій, выступае за грамадз. правы і дэмакр. свабоды, супраць расавай дыскрымінацыі, супраць злачыннай вайны ЗША ў Індакітаі і агрэс. палітыкі ў іншых раёнах свету. Уплыў кампартыі сярод працоўных і моладзі расце. У лют. 1970 узнікла камуніст. арг-цыя моладзі «Саюз маладых рабочых за вызваленне». XIX з'езд КП ЗША (1969) прыняў праграму партыі, паводле якой асноўная задача партыі — стварыць шырокі народны саюз, каб зламаць панаванне манапаліст. капіталу і забяспечыць умовы для сацыяліст. перабудовы амер. гр-ва. Вернасць гэтай лініі прадэманстравана на XX з'ездзе КП ЗША (1972), які выпрацаваў платформу партыі на прэзідэнцкіх выбарах 1972. КП ЗША ўхваліла дакументы міжнар. нарады камуністычных і рабочых партый 1957, удзельнічала ў Нарадах камуніст. і рабочых партый 1960 і 1969 у Маскве і падпісала прынятыя дакументы. Будуецца паводле прынцыпаў дэмакр. цэнтралізму. Нац. старшыня КП ЗША Г. Уінстан, ген. сакратар Г. Хол. Друк. орган штомесячны час. «Political Affairs» («Пытанні палітыкі»). КП ЗША выдае штодзённую газ. «Daily World» («Штодзённы свет»).

Літ.: Деннис Ю. Статьи и речи (1947—1951), пер. с англ., М., 1952; Foster W. Z. History of the Communist Party of the United States, New York, 1952.

КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ ІНДАНЕЗІІ (КПІ), засн. 23 мая 1920. У 1920 далучылася да Камінтэрна.

КПІ належала значная роля ў арганізацыі нац.-вызв. барацьбы інданез. народа. У 1926—27 актыўна ўдзельнічала ў нар. паўстанні супраць каланізатараў. Пры задушэнні паўстання КПІ была разгромлена і аб'яўлена па-за законам. У 1935 на в. Ява створана падпольная камуніст. арг-цыя, якая стала ядром для ўзнаўлення КПІ. У перыяд яп. акупацыі (1942—45) КПІ арганізоўвала супраціўленне захопнікам, актыўна ўдзельнічала ў нац.-вызв. рэвалюцыі ў жн. 1945, ва ўзбр. барацьбе супраць імперыял. агрэсіі ў 1945—49. Увосень 1948 унутр. рэакцыя арганізавала правакацыю ў г. Мадыуне, у выніку якой кампартыі былі нанесены вял. страты, яе кіраўнікі загінулі. У 1951 КПІ адновіла свае арг-цыі. Новае кіраўніцтва партыі ўзначаліў Д. Н. *Айдзіт*. КПІ выйшла з падполля, на V з'ездзе (1954) абвясціла курс на стварэнне адзінага нац. фронту ўсіх патрыятычных сіл краіны. На парламенцкіх выбарах 1955 КПІ атрымала больш за 6 млн. галасоў, а на выбарах у мясц. органы ўлады 1958 больш за 8 млн. галасоў (1-е месца сярод паліт. партый). У 1965 КПІ налічвала больш як 3,5 млн. членаў. Пад яе ўплывам працавалі грамадскія арг-цыі (прафсаюзы, жаночыя, маладзёжныя), якія аб'ядноўвалі каля 16 млн. чал.

З пач. 60-х г. кіраўніцтва КПІ ў значнай ступені падпала пад уплыў кіраўніцтва Кіт. кампартыі і адышло ад некат. сваіх ранейшых праграмных установак. КПІ ўзяла курс на безумоўную падтрымку дробнабурж. праграмы прэзідэнта Інданезіі А. Сукарна, чым ідэйна абязбройвала свае рады. Кіраўніцтва КПІ ў гэты перыяд аслабіла сувязі з міжнар. камуніст. рухам. Яно дапусціла сур'ёзныя памылкі ў сярэдзіне 60-х г., у перыяд рэзкага пагаршэння эканам. становішча краіны і росту незадавальнення нар. мас. Кіраўніцтва КПІ не ўзначаліла барацьбы мас супраць унутранай рэакцыі, якая набірала сілы, а падтрымала путчысцкую змову левых афіцэраў (т. зв. «Рух 30 верасня» 1965). Рэакцыя, апіраючыся на армію, задушыла путч, выкарыстала змову як падставу для развязвання крывавага тэрору супраць камуністаў і інш. патрыётаў. У 1966 КПІ і інш. прагрэс. арг-цыі забаронены. У час тэрору і ў выніку рэпрэсій загінулі кіраўнікі КПІ і сотні тысяч чл. партыі. Камуністы Інданезіі дзейнічаюць у глыбокім падполлі, выступаюць за адраджэнне партыі на марксісцка-ленінскай аснове.

В. І. Ількоў. Масква.

КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ ІНДЫІ (КПІ), засн. ў снежні 1925 у выніку аб'яднання камуніст. груп, што існавалі ў асобных правінцыях Індыі. Да 1942 фактычна працавала ў падполлі.

Паслядоўнай і мужнай барацьбой за нац. і сац. вызваленне інд. народа КПІ няспынна павялічвала свой уплыў у краіне. На першых пасля вызвалення Індыі ўсеагульных выбарах 1951—52 КПІ сабрала больш за 6 млн., а ў 1957 больш за 11 млн. галасоў. КПІ ў гэты перыяд выступіла за ўтварэнне адзінага Нац. фронту, каб давесці да канца антыфеад., антыімперыял. рэвалюцыю, забяспечыць дэмакр. і прагрэс. шлях развіцця краіны. З восені 1962 у кіраўніцтве КПІ ўзнік канфлікт в-за розніга разумення некат. пытанняў палітыкі партыі, востра праявіліся лявацкія тэндэнцыі ў яе радах, што ў 1964 прывяло да расколу КПІ. Частка членаў Нац. савета КПІ ўтварыла паралельную Камуніст. партыю Індыі.

VII з'езд КПІ (1964) прыняў праграму і статут партыі. Праграма, у прыватнасці, вызначае задачу стварыць Нацыянальна-дэмакр. фронт і нац.-дэмакр. дзяржаву як пераходную стадыю да сацыялізма. VIII з'езд (1968) прыняў папраўкі і дадаткі да праграмы і статута партыі, рашуча выступіў за адзінства ўсіх левых сіл у агульнанац. маштабе, каб адбіць наступленне рэакцыі. Дзейнасць КПІ, накіраваная на падтрымку ўсіх прагрэс. сіл краіны супраць рэакцыі, зрабіла станоўчы ўплыў на выхад датэрміновых усеагульных выбараў 1971, калі рэакц. партыі пацярпелі знішчальнае паражэнне. КПІ выступае за неадкладнае ажыццяўленне прагрэс. сац.-эканам. пераўтварэнняў, намечаных правячай партыяй Інд. нац. канграс у перадвыбарнай праграме, за далейшы зрух улева ў паліт. жыцці краіны. IX з'езд КПІ (1971) у сваіх рашэннях арыентаваў партыю на неабходнасць далейшага згуртавання прагрэс. сіл краіны, мабілізацыі нар. мас на барацьбу за паглыбленне сац.-эканам. пераўтварэнняў. КПІ ўдзельнічала ў міжнар. Нарадах камуніст. і рабочых партый у Маскве 1957, 1960 і 1969 і падпісала прынятыя дакументы. Будуецца паводле прынцыпаў дэмакр. цэнтралізму. 232 тыс. чл. (1971). Старшыня Нац. савета КПІ Ш. А. Данге, ген. сакратар Нац. савета Ч. Р. Рао. Друкаваныя органы штотыднёвая газ. на англ. мове «New Age» («Новы век»),

штомесячны тэарэт. час. «Party Life» («Партыйнае жыццё»). *А. Я. Пейсаховіч.* Мінск.

КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ ІСПАНІІ (КПІ), засн. 15.4.1920 на Нац. асамблеі Федэрацыі сацыяліст. моладзі Іспаніі пад назвайІсп. камуніст. партыя. Прынята ў Камінтэрн у 1920. У крас. 1921 левае крылоІсп. сацыяліст. партыі ўтварыла Іспан. камуніст. рабочую партыю. У ліст. 1921 абедзве партыі аб'ядналіся ў адзіную Камуніст. партыю Іспаніі.

У перыяд ваен. дыктатуры Прыма дэ Рывэры (1923—30) КПІ дзейнічала ў падполлі. Пасля звяржэння манархіі (1931) КПІ аднавіла легальную дзейнасць. Але ў кіраўніцтве КПІ пераважалі сектанцкія тэндэнцыі, што аслаблялі партыю (у 1931 яна налічвала ўсяго каля 800 чл.). IV з'езд КПІ (1932) ачысціў кіраўніцтва ад сектанцкіх элементаў, выбраў у ЦК Х. *Дыласа* (ген. сакратар КПІ у 1932—42), Д. *Ібаруры* і інш. марксістаў-ленінцаў. Пад іх кіраўніцтвам партыя ператварылася ва ўплывовую паліт. сілу краіны. КПІ належала вядучая роля ва ўзбр. выступленняхІсп. працоўных у кастр. 1934. КПІ выступіла ініцыятарам стварэння Народнага фронту (студз. 1936). Пасля перамогі Нар. фронту на выбарах у картэсы (парламент; люты 1936) КПІ змагалася за рэалізацыю яго праграмы, была важнай сілай нац.-рэвалюц. вайныІсп. народа ў 1936—39 (гл. *Іспанская рэвалюцыя 1931—39*) супрацьІсп. і міжнар. фашызму. З вер. 1936 камуністы ўваходзілі ў урад, змагаліся за адзінства антыфаш. сіл, за вядзенне вайны рэвалюц. метадамі, былі ініцыятарамі Асн. сацыяльна-эканам. і паліт. пераўтварэнняў у краіне. Колькасць чл. КПІ склала ў 1938 каля 300 тыс. (у пач. 1936 было 30 тыс. чл.). Пасля падзення рэспублікі і ўстанаўлення фаш. дыктатуры Франка (сак. 1939) КПІ прадаўжала барацьбу ў падполлі, арганізоўвала партыз. рух. прыкладала ўсе намаганні, каб не дапусціць удзелу Іспаніі ў 2-й сусв. вайне на баку фаш. агрэсараў.

У сярэдзіне 50-х г. КПІ перагледзела формы і метады барацьбы. У 1956, каб аб'яднаць усе антыфранкісцкія сілы, яна абвясціла новую паліт. лінію — палітыку «нац. згоды». Пры выпрацоўцы гэтай лініі КПІ выходзіла з магчымасці мірных змен у Іспаніі і ліквідацыі дыктатуры без новай грамадз. вайны. Разам з тым КПІ не выключае і нямірны шлях, калі рэакцыя пяройдзе да насілля. КПІ выступае за перадачу зямлі сялянам, за нац. аўтаномію для Каталоніі, краіны баскаў, Галісіі, за аддзяленне царквы ад дзяржавы і адначасова за поўную свабоду веравызнання, за ажыццяўленне палітыкі міру. Камуністы актыўна ўдзельнічаюць у разгортванні барацьбыІсп. працоўных супраць фаш. дыктатуры, выступаюць супраць размяшчэння амер. ваен. баз на тэр. краіны. КПІ ўдзельнічала ў міжнар. Нарадах камуніст. і рабочых партый 1957, 1960, 1969 у Маскве і падпісала прынятыя дакументы. Будуецца паводле прынцыпаў дэмакр. цэнтралізму. Старшыня партыі Д. Ібаруры, ген. сакратар С. *Карыльё*. Друкаваныя органы КПІ газ. «Mundo Obrero» («Рабочы свет») і час. «Nuestra Bandera» («Наш сцяг»).

Літ.: История Коммунистической партии Испании. Краткий курс, [пер. зІсп.], М., 1961.

КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ ІТАЛІІ, гл. *Італьянская камуністычная партыя.*

КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ КАРЭІ (КПК), засн. ў крас. 1925 на базе камуніст. груп, якія ўзніклі ў Карэі ў перыяд пад'ёму нац.-вызв. барацьбы супраць яп. каланізатараў і пад уплывам Вял. Кастр. сацыяліст. рэвалюцыі.

У чэрв. 1926 арганізавала масавую антыяп. дэманстрацыю працоўных, у 1927 выступіла ініцыятарам стварэння адзінага антыяп. фронту, згуртавання ўсіх патрыят. сіл краіны. Рэпрэсіі, фракцыйная барацьба, паліт. няўстойлівасць дробнабурж. інтэлігенцыі, якая на той час складала ядро партыі, прывялі да аслаблення КПК. Як арганізацыйная сіла ў 1928 перастала існаваць. Але перакананыя марксісты-ленінцы ў глыбокім падполлі не спынялі барацьбы за аднаўленне партыі і за незалежнасць краіны. У 30-я г. пад кіраўніцтвам камуністаў пачаўся ўзбр. партыз. барацьба супраць яп. каланізатараў.

Пасля вызвалення краіны Сав. Арміяй (жн. 1945) камуністы Карэі аднавілі КПК, узначалілі дэмакр. рух. У Паўн. Карэі пад кіраўніцтвам аргбюро КПК (выбрана на ўстаноўчым з'ездзе ў кастр. 1945) праведзены карэнныя дэмакр. пераўтварэнні. У Паўд. Карэі, акупаванай амер. войскамі, камуністы ўзначалілі барацьбу нар. мас супраць палітыкі амер. імперыялістаў і мясцовай рэакцыі. У жн. 1946 КПК аб'ядналася з Новай нар. партыяй на Пн (засн. ў лют. 1946) і з Народнай і Новай нар. партыямі на Пд (засн. ў 1945) у Працоўную партыю Паўн. Карэі і Працоўную партыю Паўд. Карэі. У чэрв. 1949 абедзве партыі аб'ядналіся ў адзіную *Працоўную партыю Карэі.*

КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ КІТАЯ (КПК), засн. ў 1921 пры садзеянні Камінтэрна ва ўмовах уздыму нац.-рэвалюц. руху і пашырэння ідэй марксізма-ленінізма ў Кітаі, выкліканых Вял. Кастр. сацыяліст. рэвалюцыяй. І з'езд КПК (канец чэрв.— пач. ліп. 1921, Шанхай) абвясціў канчатковай мэтай партыі пабудову ў Кітаі сацыялізма. II з'езд (1922) вызначыў найбліжэйшай задачай партыі ажыццяўіць дэмакр. рэвалюцыю. КПК на аснове супрацоўніцтва з Гаміньданам (нац.-бурж. партыяй) актыўна ўдзельнічала ў антыімперыял. бурж.-дэмакр. рэвалюцыі 1925—27. У крас.— ліп. 1927 Чан Кай-шы і інш. правыя лідэры Гаміньдана зрабілі контррэвалюц. пераварот і пачалі супраць КПК масавы тэрор. КПК прадаўжала кіраваць рэвалюц. барацьбой, аддавала вялікую ўвагу буд-ву ўзбр. сіл, стварала апорныя базы ў сельскіх р-нах. Праз усю гісторыю КПК праходзіць барацьба паміж дзвюма лініямі — пралетарска-інтэрнацыяналістычнай і дробнабуржуазна-нацыяналістычнай, а таксама барацьба супраць правых і «левых» апартуністычных ухілаў. У 1937—45, калі імперыял. Японія вяла захопніцкую вайну супраць Кітая, КПК змагалася за згуртаванне ўсіх патрыят. сіл краіны ў адзіны антыяп. фронт. У 1946, пасля таго як чанкайшысцкі Гаміньдан пачаў грамадз. вайну, КПК узняла кіт. народ на рашучую барацьбу, якая пры падтрымцы Сав. Саюза, краін нар. дэмакратыі і сусв. камуніст. руху закончылася перамогаю рэвалюцыі і ўтварэннем Кіт. Нар. Рэспублікі (1.10.1949).

Да 1953 КПК выпрацавала ген. лінію на пераходны перыяд да сацыялізма. VIII з'езд КПК (1956) зацвердзіў марксісцка-ленінскія ўстаноўкі па карэнных пытаннях унутр. і знешняй палітыкі партыі. У канцы 50-х г. у кіраўніцтве КПК стаў пераважаць вялікадзярж. нацыяналістычны курс, тэндэнцыі яко-

га выяўляліся ў КПК і раней, асабліва пасля таго, як партыю ўзначаліў Мао Цзэ-дун (1935). 2-я сесія VIII з'езду КПК (1958) адобрыла авантурыстычны курс «Трох чырвоных сцягоў» («ген. лінія», «нар. камуны», «вялікі скачок»), які на сутнасці азначаў адмаўленне ад планавага развіцця эканомікі і прывёў да крызісу нар. гаспадаркі краіны. У знешняй палітыцы кіраўніцтва КПК з пач. 60-х г. стала адкрыта ажыццяўляць свой асабліви гегеманістычны курс, які парывае з асн. палажэннямі Дэкларацыі 1957 і Заявы 1960, прынятых міжнар. Нарадамі камуніст. і рабочых партый. IX з'езд КПК (1969) адобрыў т. зв. «культурную рэвалюцыю», у ходзе якой у 1966—67 былі разгромлены парт. арг-цыі (акрамя арміейскіх), пажыццёва назваў Мао Цзэ-дуна «правадыром» КПК. Рашэнні IX з'езду КПК узялі барацьбу супраць КПСС, раскольніцкую дзейнасць у сусв. камуніст., рабочым і нац.-вызв. руху на ўзровень праграмных задач. Кіраўніцтва КПК адмовілася ўдзельнічаць у міжнар. Нарадзе камуніст. і рабочых партый 1969. Па афіц. звестках у ліп. 1956 у КПК было 10 734 384 чл., з іх 14% рабочых, каля 69% сялян, каля 12% прадстаўнікоў інтэлігенцыі і 5% іншых. У 1961 КПК налічвала больш за 17 млн. чл. Колькасць чл. КПК у сучасны момант невядомая. Старшыня ЦК КПК *Мао Цзэ-дун*. Друкаваныя органы газ. «Жэньмінь жыбао» («Народная газета») і час. «Хунцы» («Чырвоны сцяг»).

В. Елізараў. Масква.

КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ КУБЫ (КПК), засн. на Устаноўчым з'ездзе ў жн. 1925 у Гаване ў выніку аб'яднання камуніст. гуртоў, што існавалі ў краіне, і левага крыла Рабочай сацыяліст. партыі Кубы. У хуткім часе пасля заснавання аб'яўлена па-за законам. Легалізавана ў вер. 1938.

У 1939 КПК аб'ядналася ў адзіны блок з Рэвалюц. саюзам, створаным незадоўга да гэтага часу, і ўдзельнічала ў выбарах ва Устаноўчы сход, завалявала 6 месцаў. У 1940 КПК і Рэвалюц. саюз аб'ліліся і ўтварылі адзіную марксісцка-ленінскую партыю Рэвалюцыйны камуніст. саюз, які ў студз. 1944 перайменавана ў Народна-сацыяліст. партыю Кубы (НСПК). Партыя вяла актыўную работу па прапагандзе ідэй марксізма-ленінізма сярод працоўных, якія пры актыўным удзеле камуністаў дамагліся важных сац. і эканам. заваёў. У канцы 1946 — пач. 1947 рэакцыя зноў пачала тэрор і ганенні на камуністаў. Ад рук наёмных забойцаў загінулі многія відныя дзеячы партыі. Пасля дзярж. перавароту, які зрабіў у сак. 1952 Батыста, НСПК рашуча выступіла супраць дыктатарскага рэжыму, за аб'яднанне ўсіх сіл, што былі ў апазіцыі да ўрада. У ліст. 1953 урад забараніў дзейнасць НСПК. Партыя выступіла на падтрымку ўзбр. барацьбы супраць дыктатарскага рэжыму, якой кіраваў *Ф. Кастра Рус*. Многія члены НСПК змагаліся ў партыз. атрадах.

Перамога Кубінскай рэвалюцыі, радыкальныя сац.-эканам. пераўтварэнні, што адбыліся ў краіне і садзейнічалі пераходу Кубы на шлях будаўніцтва сацыялізма, далейшае згуртаванне дэмакр. сіл спрыялі ўтварэнню адзінай рэвалюц. партыі кубінскага народа. У сярэдзіне 1961 арг-цыі кубінскіх патрыётаў — «Рух 26 ліпеня», «Рэвалюцыйны дырэктарат 13 сакавіка», што сфарміраваліся ў перыяд барацьбы супраць дыктатуры Батысты, і НСПК утварылі Аб'яднаныя рэвалюц. арг-цыі, на базе якіх у 1962—63 узнікла Адзіная партыя сацыяліст. рэвалюцыі Кубы. У кастр. 1965 партыя перайменавана ў Камуністычную партыю Кубы. КПК узначальвае сацыяліст. будаўніцтва ў краіне. Каля 165 тыс. чл. (1972). Першы сакратар ЦК КПК Ф. Кастра Рус. Друкаваны орган штодзённая газ. «Granma» («Гранма»).

А. Ц. Дарусенкай. Масква.

КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ (БАЛЬШАВІКОЎ) ЛІТВЫ І БЕЛАРУСІ [КП(б)ЛіБ], кіруючая і накіроўваючая сіла працоўных *Літоўска-Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі* (Літбела) у барацьбе за ўмацаванне ўлады Саветаў, дыктатуры пралетарыяту, у абароне ад замежнай інтэрвенцыі і ўнутр. контррэвалюцыі ў 1919—20, састаўная часць РКП(б). Створана ў выніку аб'яднання *Камуністычнай партыі Беларусі* і *Камуністычнай партыі Літвы і Заходняй Беларусі* на Аб'яднаўчым з'ездзе 4—6.3.1919 у Вільні [гл. *Друк з'езд КП(б)Б*].

Стварэнне Літбела і КП(б)ЛіБ падрыхтавана сумеснай рэвалюц. барацьбой працоўных Беларусі і Літвы на чале з партыяй бальшавікоў супраць царызму і капіталізму, сац. і нац. прыгнёту. *Паўночна-Заходні камітэт РСДРП*, утвораны па ініцыятыве ЦК РСДРП у сак. 1904 у Вільні, аб'ядноўваў Мінскую, Віленскую, Віцебскую, Смаргонскую, Бабруйскую і інш. арг-цыі РСДРП. У жн. 1905 Паўн.-Зах. к-т рэарганізаваны ў *Паўночна-Заходні саюз РСДРП*, а ў чэрв. 1906 — у *Абласны саюз РСДРП Літвы і Беларусі* (гл. таксама *Віленскі арганізацыя РСДРП*, *Віленская скруговая арганізацыя РСДРП*). На тэрыторыі, акупаванай яго войскамі ў 1-ю сусв. вайну, дзейнічала камуніст. падполле, якім кіраваў *Краёвы камітэт камуністычных арганізацый Беларусі і Літвы* (1915), створаны па ініцыятыве ЦК РКП(б). Важнае значэнне ў аб'яднанні парт. сіл на акупаванай немцамі тэрыторыі належала Кампартыі Літвы, якая ўзнікла ў кастр. 1918 як Камуністычная партыя Літвы і Заходняй Беларусі (КПЛіЗБ) і, акрамя літоўскіх, уключала арг-цыі Гродзенскай і часці Мінскай губ. Для аб'яднання сіл у барацьбе супраць контррэвалюц. небяспекі з боку бурж. Польшчы *Другая канферэнцыя Кампартыі Літвы і Заходняй Беларусі* (2—4.2.1919) прыняла рэзалюцыю «Пра аб'яднанне Літвы і Беларусі».

Аб'яднаўчы з'езд (4—6.3.1919) вітаў утварэнне Літбела і пастанавіў аб'яднаць КП(б)Б і КПЛіЗБ у адзіную КП(б)ЛіБ. Для кіраўніцтва парт. работай ён выбраў *Цэнтральны Камітэт КП(б) Літвы і Беларусі*, які 8.3.1919 выбраў Прэзідыум ЦК: В. С. Міцкявічус-Капсукас (старшыня), В. Г. Кнорын (сакратар), З. І. Ангарэніс, А. Ф. Мяснікоў, Я. Г. Далецкі, С. В. Іваноў; 29.4.1919 утвораны Палітбюро і Аргбюро ЦК КП(б)ЛіБ. ЦК, гарадскія, павятовыя, валасныя к-ты КП(б)ЛіБ накіроўвалі сваю дзейнасць на выкананне рашэнняў VIII з'езду РКП(б) (1919), ажыццяўленне палітыкі ваеннага камунізма, умацаванне дыктатуры пралетарыяту і абараназдольнасці рэспублікі. Пад кіраўніцтвам КП(б)ЛіБ праводзілася нацыяналізацыя прамысл. прадпрыемстваў, чыгунак, банкаў, аднаўляліся ф-кі, з-ды, транспарт. З мэтай прапаганды сацыяліст. вядзення с. гасп. на базе колішніх маёнткаў у лютым — крас. 1919 створана 1416 саўгасаў. Аднак у тэзісах ЦК КП(б)ЛіБ «Аб прынцыпах вядзення сацыялізма ў вёсцы» (прынятых 1.7.1919), як і ў рашэннях Аб'яднаўчага з'езду, дапушчаны памылкі — забарона надзялення

працоўных сялян канфіскаванай у памешчыкаў зямлёй. Гэтыя памылкі пазней выпраўлены ў тэзісах ЦК КП(б)ЛіБ аб агр. палітыцы на Беларусі (24.5.1920), на падставе якіх сялянам перададзена 75% былой абшарніцкай зямлі. Літбел першая прыняла на сябе ўдар бурж. Польшчы. КП(б)ЛіБ і ЦВК Літбела аб'явілі рэспубліку на ваен. становішчы, мабілізавалі працоўных на адпор інтэрвентам. Рашэннем ЦК КП(б)ЛіБ 11.4.1919 у паветах створаны ваен. камісіі для мабілізацыі камуністаў; 19.4.1919 створаны Савет абароны Літбела, якому перададзена ўся цывільная і ваен. ўлада. Мінская гарадская парт. арг-цыя накіравала на фронт 60% свайго складу, павятовая — 50%. У маі 1919 на фронт мабілізаваны як санітаркі і мед. сёстры жанчыны-камуністкі і спачувальніцы. Паводле пастановы ЦК КП(б)ЛіБ ад 9.5.1919 камсамол Літбела аб'явіў свае арг-цыі на ваен. становішчы. Камуністы і камсамольцы, рабочыя і сяляне з часцямі Чырв. Арміі гераічна абаранялі ад польскіх інтэрвентаў сталіцы Літбела Вільню і Мінск. Вял. дапамогу ў арганізацыі адпору інтэрвентам Літбел меў ад ЦК РКП(б) і асабіста ад У. І. Леніна. 22.5.1919 ЦК РКП(б) пастанавіў паслаць на Зах. фронт камуністаў, мабілізаваных у Смаленскай, Віцебскай і Магілёўскай губ. для Усх. фронту. 31.5.1919 Ленін запатрабаваў тэрмінова высветліць, што з аброі трэба і можна паслаць у Мінск для арганізацыі рабочых батальёнаў; бесперабойна забяспечваць Зах. фронт усім неабходным. ЦК РКП(б) паслаў на Зах. фронт агіт.-інструктарскі поезд «Кастрычніцкая рэвалюцыя» на чале з М. І. Калінінам (гл. *Агітпаязды*), які пабываў у Мінску, Смаленску, Віцебску, Оршы, Магілёве, Жлобіне, Гомелі, Бабруйску і інш. Важным для абароны Літбела было стварэнне ў чэрв. 1919 ваен.-паліт. саюзу сав. рэспублік. У сувязі з уступленнем Літоўска-Беларускай ССР у ваен.-паліт. саюз і ў сувязі з тым, што Мінск стаў тэатрам ваен. дзеянняў, 16.7.1919 ЦК КП(б)ЛіБ перадаў ваен. функцыі ваен. органам, а цывільныя — СНК; 18.7.1919 спыніў сваю дзейнасць Савет абароны Літбела. Пасля акупацыі Мінска (8.8.1919) ЦК КП(б)ЛіБ пераехаў у Бабруйск, потым у Смаленск і адтуль кіраваў камуніст. падполлем і партыз. рухам на акупаванай тэр. 3.9.1919 створана Бюро па нелегальнай рабоце. 11.11.1919 пленум ЦК КП(б)ЛіБ пастанавіў наладзіць больш цесную сувязь з кампартыямі акупаваных Латвіі і Эстоніі, а таксама з Кампартыяй Польшчы. Гал. цэнтрамі камуніст. падполля былі Мінск, Вільня, Коўна, Бабруйск; бальшавіцкія арг-цыі дзейнічалі ў Лідзе, Слоніме, Брэсце, Пінску, Мазыры, Ваўкавыску, Кобрыне, Лунінцы, Гродне, Беластоку, Слуцку, Маладзечне, Барысаве і інш. (гл. *Падпольныя камуністычныя арганізацыі ў гады грамадзянскай вайны і ваеннай інтэрвенцыі ў СССР*). У тэзісах ЦК КП(б)ЛіБ ад 19.1.1920 адзначалася, што асн. змест рэвалюц. руху на акупаванай тэр.— барацьба за ўладу Саветаў, за дыктатуру пралетарыяту. На захопленай ворагам тэр. Літбела разгарнуўся масавы партыз. рух, які адыграў важную ролю ў разгроме інтэрвентаў (гл. *Партызанскі рух на Беларусі ў гады грамадзянскай вайны*). ЦК КП(б)ЛіБ вёў вялікую прапаганд. работу. Выдаваліся газ. «Звезда», «Савецкая Беларусь», «Komunistas», «Komunista» і «Miot» («Молат», польск.), творы Леніна, брашуры, адозвы.

Для падрыхтоўкі парт. кадраў 15.9.1919 пры ЦК КП(б)ЛіБ створана камуніст. школа (130 чал.). Мінскі гарком у ліп. 1919 адкрыў 2 палітшколы для чырвонаармейцаў. Для вядзення прапаганды ў ліп. 1919 створана бюро на чале з А. Р. Чарвяковым, а ў паветах — камісіі. 25.4.1920 пачалі наступаць войскі бурж. Польшчы. ЦК РКП(б), Савет працы і абароны рабілі ўсе захады для ўмацавання Зах. фронту. 23.5.1920 ЦК РКП(б) апублікаваў тэзісы «Польскі фронт і нашы задачы». У адказ парт., камсамольскія і прафс. арг-цыі правялі новыя масавыя мабілізацыі сваіх членаў на фронт. Значную работу па мабілізацыі ў Чырв. Армію ўраджэнцаў Літвы і Беларусі, што жылі ў цэнтр. р-нах краіны, правёў Літ.-Бел. аддзел прапаганды і агітацыі пры ЦК РКП(б). 4.7.1920 у наступленне перайшлі сав. войскі. 11 ліп. яны вызвалілі Мінск, 1 жн. Брэст і выйшлі на тэр. Польшчы. ЦК КП(б)ЛіБ вярнуўся ў Мінск і стварыў Мінскую губ. парт.-арганіз. тройку, якая 30.7.1920 утварыла Мінскі губ. к-т КП(б)ЛіБ. 31.7.1920 ад імя КП(б)ЛіБ і прафсаюзаў апублікавана «Дэкларацыя аб абвяшчэнні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі», якая аднаўляла законы Сав. улады, заклікала да ўмацавання ваен.-паліт. і гасп. саюзу з Сав. Расіяй. У сувязі з тым, што ў Літве ўладу захапілі буржуазія і памешчыкі, узнікла неабходнасць падзяліць КП(б)ЛіБ на КП(б)Б і КП(б)Л. 9.8.1920 Аргбюро ЦК РКП(б) пастанавіла назваць Мінскі губком КП(б)ЛіБ Цэнтральным Бюро КП(б)Б, захаваўшы агульную назву партыі — КП(б)ЛіБ. 3.9.1920 ЦБ КП(б)Б вынесла прапанову ліквідаваць ЦК КП(б)ЛіБ. Адбылося ліквідацыйнае пасяджэнне. ЦК РКП(б) санкцыянаваў падзел КП(б)ЛіБ на КП(б)Б і КП(б)Л. 8.11.1920 ЦБ КП(б)Б вырашыла будучую парт. канфер. назваць *Трэцім з'ездам КП(б)Б* (22—25.11. 1920). З'езд выбраў ЦБ КП(б)Б. Віднымі парт., дзярж. і ваен. дзеячамі перыяду КП(б)ЛіБ былі В. С. Міцкявічус-Капсукас, В. Г. Кнорын, А. Ф. Мяснікоў, З. І. Ангарэніс, К. Г. Цыхоўскі, Я. Г. Далецкі, С. В. Іваноў, М. І. Калмановіч, С. І. Берсан, А. Р. Чарвякоў, В. А. Багуцкі, І. С. Уншліхт, Я. Ф. Пярно, Ш. Ш. Ходаш і інш. Падпольныя бальшавіцкія арг-цыі ўзначальвалі М. Дзямба (Ян), Ю. Крваўніцкі (Э. Кундзіч), С. Куляшынскі (Артур), М. А. Броніна (М. Баброва), П. П. Фёдараў (Дзяпроўскі), Ф. Л. Каменскі (Фальк), М. А. Ляўкоў, І. І. Бачко, М. В. Юшкевіч і інш.

Літ.: КП(б)Б у рэзалюцыях, ч. 1 (1903—1921 гг.), Мн., 1934; Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 1, 2 изд., Мн., 1968; Вопросы истории Коммунистической партии Литвы, Вильнюс, 1961; Хроника важнейших событий

истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 2, Мн., 1970; Шкляр Е. Н. Борьба трудящихся Литовско-Белорусской ССР с иностранными интервентами и внутренней контрреволюцией (1919—1920 гг.), Мн., 1962. *Я. Н. Шкляр.* Мінск.

КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ ЛІТВЫ І ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (КПЛіЗБ), партыйная арганізацыя, якая дзейнічала на акупаванай кайзераўскай Германіяй тэр. Літвы і Зах. Беларусі. З'яўлялася часткай РКП(б) і працавала пад яе кіраўніцтвам. Створана ў кастр. 1918 на сваім І з'ездзе, які прызнаў асн. задачай партыі выгнанне ням. акупантаў, звяржэнне панавання буржуазіі і ўстанаўленне Сав. улады, прыняў Статут, выбраў ЦК (П. Эйдукявічус, Р. Піляр, С. Грыбас, К. Керновіч, А. Якшэвічус, у снеж. 1918 кааптаваны В. С. Міцкявічус-Капсукас і З. І. Ангарэціс). Ад І з'езду КПЛіЗБ бярэ пачатак Кампартыя Літвы. Пад кіраўніцтвам КПЛіЗБ праводзіліся стачкі і мітынгі працоўных у Вільні, Гродне, Коўне, Лідзе, Папявежы, Шаўлях і інш. Яшчэ да выгнання ням. акупантаў былі створаны і дзейнічалі органы Сав. улады. На пасяджэнні ЦК КПЛіЗБ 8.12.1918 у Вільнюсе ўтвораны Часовы рэвалюц. рабоча-сялянскі ўрад, які 16.12.1918 выдаў Маніфест пра абвяшчэнне ў Літве і Зах. Беларусі Сав. улады. У канцы снеж. 1918 ЦК КПЛіЗБ стаў выдаваць газ. «Камуніст» на рус., літ., польск. і яўр. мовах. КПЛіЗБ правяла з'езд і 2 канферэнцыі [гл. *Першы (Устаноўчы) з'езд Кампартыі Літвы і Заходняй Беларусі, Першая канферэнцыя Кампартыі Літвы і Заходняй Беларусі, Другая канферэнцыя Кампартыі Літвы і Заходняй Беларусі*]. І з'езд КПЛіЗБ назваў партыю Кампартыяй Літвы і Беларусі 1-й акупацыі (да 1-й акупацыі адносілася тэрыторыя, захопленая немцамі ўвосень 1915 па лініі Дзвінск — Нарач — Крэва — Навагрудак — Баранавічы — Пінск, г. зн. да новага наступлення немцаў у лют. 1918). ІІ канфер. КПЛіЗБ выказалася за аб'яднанне Літ. ССР і Бел. ССР у адну Літоўска-Беларускую ССР. Пасля ўтварэння Літбела КПЛіЗБ аб'ядналася з Кампартыяй Беларусі ў адзіную *Камуністычную партыю (бальшавікоў) Літвы і Беларусі* [КП(б)ЛіБ].

Літ.: КП(б)Б у рэзалюцыях, ч. 1 (1903—1921 гг.), Мн., 1934; Очерки истории Коммунистической партии Литвы, т. 1 (1886—1920 гг.), Вильнюс, 1967, № 11; 1968. № 1.

М. В. Тамашунас. Вільнюс.

КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ ПОЛЬШЧЫ (КПП; да лютага 1925 Камуністычная рабочая партыя Польшчы), створана ў снеж. 1918 у выніку аб'яднання Сацыял-дэмакратыі Каралеўства Польскага і Літвы (СДКПіЛ) і Польскай сацыяліст. партыі-лявіцы (ППС-лявіцы) ва ўмовах рэвалюц. ўздыму ў краіне, які ўзмацніўся пад уплывам Вял. Кастр. сацыяліст. рэв. Адна з заснавальнікаў Камінтэрна (1919).

І з'езд КПП (16.12.1918) прыняў паліт. платформу і маніфест, заклікаў працоўных краіны змагацца за дыктатуру пралетарыяту, за перамогу сацыялізма ў краіне, пашырыць Саветы рабочых дэпутатаў, якія на той час узніклі ўжо ва ўсіх прамысл. цэнтрах Польшчы. З'езд абвясціў салідарнасць з Сав. Рэспублікай. Аднак з-за памылковых поглядаў, напр. па нац. і сялянскім пытанні, ладаў КПП не змагла згуртаваць увесь рабочы клас і забяспечыць яго гегемонію ў рэвалюц. барацьбе. Польская буржуазія пры падтрымцы імперыялістаў ЗША, Вялікабрытаніі і Францыі задушыла рэвалюц. рух у краіне. КПП пайшла ў падполле. У жн. 1922 КПП стварыла паўлегальную арг-цыю Саюз пралетарыяту горада і вёскі, па спісе якой удзельнічала ў парлам. выбарах 1922. На ІІ з'ездзе (1923) КПП у асн. стала на ленінскія пазіцыі, у т. л. па сялянскім і нац. пытаннях. Партыя выступіла за адзіны фронт рабочага класа, за саюз рабочага класа і сялянства. КПП паслядоўна адстойвала прынцыпы пралет. інтэрнацыяналізму, права нацый на самавызначэнне, выступала супраць прыгнечання бел. і укр. насельніцтва ў Польшчы. З 1923 у КПП на правах аўт. арг-цый уваходзілі *Камуністычная партыя Заходняй Беларусі* (КПЗБ) і *Камуністычная партыя Заходняй Украіны* (КПЗУ). КПП усё больш узмацняла свае уплыў на розныя слаі працоўных, мацавала сваю рабочага класа і сялянства. Узніклі партыі і арг-цыі, якія цесна супрацоўнічалі з КПП: Незалежная сялянская партыя (1924—27), Беларуска-сялянска-рабочая грамада (1925—27), «Сельроб» (1926—29) і інш. Ва ўмовах санацыйна-фаш. дыктатуры, якая ўсталявалася ў Польшчы пасля перавароту Пілсудскага (1926), КПП арганізавала шматлікія выступленні рабочых і сялян на абарону іх жыццёвых інтарэсаў. КПП выступіла ініцыятарам адзінства дзеянняў камуністаў і сацыялістаў за аб'яднанне ўсіх прагрэс. сіл для барацьбы супраць фашызму, за мір. КПП патрабавала разарваць дагавор Польшчы з фаш. Германіяй, падпісаны ў 1934, выступала за дружбу з СССР. Тысячы камуністаў Польшчы змагаліся ў Іспаніі ў 1936—39 у радах рэспубліканцаў. Друкаваныя органы КПП выходзілі нелегальна: газ. «Czerwony sztandar» («Чырвоны сцяг») і тэарэт. час. «Nowy przegląd» («Новы агляд»).

У 1938 на падставе неабгрунтаваных, як пазней высветлілася, падазрэнняў у шпіёнскім пранікненні варожай агентуры ў рады кіруючых работнікаў партыі Выканком Камінтэрна распусціў КПП. Аднак камуністы прадаўжылі барацьбу ў розных грамадскіх арг-цыях. Пасля нападу гітлераўскай Германіі на Польшчу (вер. 1939) камуністы ўзначалілі выз. барацьбу польскага народа супраць ням.-фаш. захопнікаў. У 1942 былыя члены КПП сталі ініцыятарамі стварэння Польскай рабочай партыі, якая стала пераемніцай лепшых традыцый КПП. У 1956 пяць братніх партый (КПСС, Італьян. кампартыя, Балгарская кампартыя, кампартыя Фінляндыі і ПАРП) прынялі сумесную заяву, у якой прызналі абвінавачанні ў адрас КПП фальсіфікаванымі, а яе роспуск неабгрунтаваным. КПП была ачышчана ад паклёпніцкіх выдумак, а яе кіраўнікі рэабілітаваны.

Літ.: Коммунистическая партия Польши в борьбе за независимость своей страны. Материалы и документы, пер. с польск., М., 1955; Мацко А. Н. Борьба трудящихся Польши и Западной Белоруссии против фашизма (1933—1939 гг.), Мн., 1963; Kowalski J. Zarys historii polskiego ruchu robotniczego w latach 1918—1939. cz. 1. 2 wyd., Warszawa, 1962.

Э. М. Позняк. Мінск.

КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ РУМЫНІІ, гл. *Румынская камуністычная партыя.*

КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ САВЕЦКАГА САЮЗА (КПСС), баявы выпрабаваны авангард сав. народа, які аб'ядноўвае на добраахвотнай аснове перадавую, найб. свядомую частку рабочага класа, калгаснага сялянства і інтэлігенцыі СССР. Заснавана У. І. Леніным як рэвалюц. марксісцкая партыя рабочага класа. У выніку поўнай і канчатковай перамогі сацыялізма ў СССР КПСС, партыя рабочага кла-

са, стала партыяй усяго сав. народа. Яна кіруе стваральнай дзейнасцю працоўных, надае арганізаваны, планамерны, навукова абгрунтаваны характар іх барацьбе за пабудову камунізма. КПСС існуе для народа, у служэнні яко му бачыць сэнс сваёй дзейнасці. Партыя — найвышэйшая форма грамадска-паліт. арг-цыі. Кіруючую ролю ў сав. грамадстве ажыццяўляе праз сістэму дзярж. і грамадскіх арг-цый: Саветы, прафсаюзы, камсамол, кааперацыю і інш., шляхам арганізатарскай і ідэйна-выхаваўчай работы. У сваёй дзейнасці кіруецца вучэннем марксізма-ленінізма, распрацаваным на яго аснове *Праграмай Камуністычнай партыі Савецкага Саюза*, у якой навукова вызначаны асноўныя задачы партыі і народа ў барацьбе за пабудову камуніст. грамадства. Унутрыпарт. жыццё рэгулюецца *Статутам Камуністычнай партыі Савецкага Саюза*, у якім замацаваны ленінскія арганіз. прынцыпы: *дэмакратычны цэнтралізм, калектыўнасць партыйнага кіраўніцтва, дэмакратыя ўнутрыпартыйная, крытыка і самакрытыка*, свядомая дысцыпліна, актыўнасць і самадзейнасць, ідэйнае і арганіз. адзінства ўсіх членаў. КПСС будуецца паводле тэр.-вытв. прынцыпу, аснова яе — пярвічная парт. арганізацыя. Чл. КПСС можа быць кожны грамадзянін СССР, які прызнае яе Праграму і Статут, актыўна ўдзельнічае ў буд-ве камунізма, працуе ў адной з пярв. арг-цый, выконвае рашэнні партыі і плаціць членскія ўзносы. Новыя чл. прымаюцца з кандыдатаў, якія прайшлі канд. стаж (гл. *Кандыдат у члены КПСС*). Вярх. орган партыі — *з'езд КПСС*, які выбірае *Цэнтральны Камітэт КПСС* (ЦК КПСС), *Цэнтральную Рэвізійную Камісію КПСС*. Для кіраўніцтва работай партыі паміж пленумамі ЦК выбірае *Палітбюро ЦК КПСС, Сакратарыят ЦК КПСС* і *Генеральнага сакратара ЦК КПСС*. КПСС — неад'емная састаўная частка, агульнапрызнаны авангард міжнар. камуніст. і рабочага руху. Яна кіруецца прынцыпам пралетарскага інтэрнацыяналізму, змагаецца за ўмацаванне адзінства і згуртаванасці камуністаў усяго свету (гл. *Адзінства партыі*).

Пачатак рабочага руху і распаўсюджванне марксізма ў Расіі (1883—94). КПСС прайшла цяжкі і слаўны шлях ад невялікіх марксісцкіх гурткоў у апошняй трэці 19 ст. да 14,5-мільённага авангарда будаўнікоў камунізма. Узнікненне марксісцкай партыі ў Расіі падрыхтавана ўсім ходам грамадска-паліт. развіцця, у першую чаргу ўступленнем краіны на шлях капіталізму, фарміраваннем прамысл. пралетарыяту, поспехамі міжнар. рабочага руху і ўсталяваннем марксізма ў с.-д. руху Зах. Еўропы.

У 70-я г. стачачная барацьба пралетарыяту ахапіла шэраг прамысл. раёнаў, узніклі першыя рабочыя арг-цыі — *«Паўднёварасійскі саюз рабочых»* (1875, Адэса) і *«Паўночны саюз рускіх рабочых»* (1878, Пецярбург), якія заявілі пра салідарнасць з эканам. прыгнётам і паліт. бяспраўем штурхалі працоўных, прыгнечаных народы нац. ускраін на барацьбу супраць бурж.-памешчыцкага ладу. Узначаліць гэтую барацьбу быў заклікана расійскі пралетарыят — гал. рэвалюц. сіла грамадства. Каб выканаць ролю кіраўніка, ён павінен быў стварыць марксісцкую рэвалюц. партыю. Узнікненне такой партыі ў Расіі ў канцы 19 ст. з'яўлялася аб'ектыўнай неабходнасцю. Яно падрыхтавана сац.-эканам. развіццём краіны і рэвалюц. традыцыямі, якія ішлі ад сялянскіх паўстанняў, барацьбы А. М. Радзішчава і дзекабрыстаў, дзейнасці В. Р. Бялінскага, А. І. Герцэна, М. Г. Чарнышэўскага, М. А. Дабралюбава і інш. дэмакратаў-шасцідзесятнікаў і рэвалюц. народнікаў 70-х г. 19 ст., якіх Ленін назваў папярэднікамі расійскай с.-д. Аднак ідэалогія народніцтва была глыбока памылковая, у 80-я г. народніцтва перараджаецца з рэвалюц. плыні ў ліберальную.

Крытыку народніцтва і распаўсюджванне марксізма ў Расіі пачалі першыя рас. марксісты на чале з Г. В. Пляханавым і створаная ім *група «Вызваленне працы»*. Яны пачалі распрацоўваць праблемы рас. вызв. руху з пазіцый марксізма, тэарэт. заснавалі рас. сацыял-дэмакратыю, замацавалі ў Расіі марксізм як плынь грамадскай і рэвалюц. думкі. Падпольныя с.-д. гурткі і групы ўзніклі ў Пецярбурзе (Дз. М. Благоева, П. В. Тачыскага, М. І. Бруснёва), Паволжы (М. Я. Федасеева), на Украіне, Беларусі, у Польшчы, Літве. Ленін лічыў 1883—94 пачатковым перыядам у гісторыі рус. сацыял-дэмакратыі, калі навук. сацыялізм і рабочы рух існавалі асобна адзін ад аднаго.

Барацьба за стварэнне марксісцкай партыі ў Расіі. Узнікненне бальшавізму (1894—1903). З сярэдзіны 90-х г. 19 ст. пачынаецца пралетарскі перыяд вызв. руху ў Расіі і новы этап барацьбы за стварэнне марксісцкай партыі рабочага класа, звязаны з рэвалюц. дзейнасцю У. І. Леніна. Яго тэарэт. і практ. дзейнасць склала цэлую эпоху ў развіцці марксізма, знаменавала ўзнікненне ленінізма — прадаўжэння і развіцця марксізма ў новых гістар. умовах. Ленінскі этап у развіцці марксізма і ў практыцы рэвалюц. барацьбы абумоўлены двума звязанымі паміж сабою працэсамі развіцця грамадства: уступленнем капіталізму ў вышэйшую і апошнюю стадыю — імперыялізм і перамяшчэннем цэнтра сусв. рэвалюц. руху ў Расію, якая з'яўлялася вузлавым пунктам усіх супярэчнасцей імперыялізму.

Увосень 1893 Ленін пераехаў у Пецярбург, аб'яднаў вакол сябе марксістаў і стаў іх кіраўніком. У творах «Што такое «прыяцелі народа» і як яны ваююць супраць сацыял-дэмакратаў?» (1894), «Эканамічны змест народніцтва і крытыка яго ў кнізе п. Струве» (1895), «Развіццё капіталізму ў Расіі» (1899) і інш. Ленін закончыў ідэйны разгром народніцтва — гал. перашкоду на шляху с.-д. руху ў Расіі, падвергнуў крытыцы «легальных марксістаў» (гл. *«Легальны марксізм»*) і выкрыў іх як рэвізіяністаў, замаскіраваных ворагаў марксізма. Ён не толькі абараніў рэвалюц. вучэнне Маркса — Энгельса, але ўзбагаціў яго новымі палажэннямі і вывадамі, даказаў, што ў Расіі ўзровень развіцця капіталізму стварыў матэрыяльныя перадумовы для пераходу да сацыялізма; выставіў ідэю гегемоніі пралетарыяту ў дэмакр. і сацыяліст. рэвалюцыі, ідэю рэвалюц. саюзу рабочага класа і сялянства як гал. ўмову перамогі над царызмам і капіталізмам, паказаў, што стварэнне рэвалюц. марксісцкай партыі ў Расіі — аб'ектыўная па-

трэба грамадскага развіцця: «дайце нам арганізацыю рэвалюцыянераў — і мы перавернем Расію!» (Тв., т. 5, с. 433). У 1895 Ленін стварыў *Пецярбургскі «Саюз барацьбы за вызваленне рабочага класа»*, які з'яўляўся зародкам рэвалюц. пралет. партыі ў Расіі, упершыню пачаў спалучаць марксізм з рабочым рухам. Пад яго ўплывам с.-д. арг-цыі ўзніклі ў многіх гарадах, у т. л. і на Беларусі (Гомель, Мінск, Віцебск, Гродна, Бабруйск, Магілёў, Смаргонь, Брэст, Пінск і інш.). Ленін выказаў ідэю аб'яднання вакол «Саюза барацьбы» ўсіх с.-д. гурткоў і груп у адзіную пралет. партыю, дамагаўся склікання парт. з'езду, напісаў «Праект праграмы» і «Тлумачэнне праграмы» с.-д. партыі.

1—3(13—15).3.1898 у Мінску адбыўся *Першы з'езд РСДРП*, які прыняў рашэнні пра стварэнне партыі, яе арганіз. будову, выбраў ЦК. У крас. 1898 апублікаваны прыняты з'ездам *«Маніфест Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі»*. Ленін, які знаходзіўся ў ссылцы, вітаў з'езд і разглядаў утварэнне партыі як «вялізны крок наперад». У перыяд «Саюза барацьбы» і I з'езду РСДРП пачалася закладка ідэйных асноў бальшавізму. Але выбраны на з'ездзе ЦК неўзабаве быў арыштаваны, з'езд не распрацаваў Праграмы і Статута партыі, і РСДРП як цэнтралізаваная арг-цыя фактычна не была створана.

У радах РСДРП выступіла першая апартуністычная плынь — эканамісты, якія рэвізавалі марксізм, адмаўлялі неабходнасць палітычнай барацьбы і самастойнай палітычнай партыі рабочага класа, заклікалі да барацьбы толькі за эканам. патрэбы. Барацьбу рэвалюц. марксістаў супраць апартунізму, за стварэнне сапраўды рэвалюц. партыі ўзначаліў Ленін. Вырашальную ролю ў гэтым адыгралі створаная ім нелегальная палітычная газета «Искра» (1900) і кніга «Што рабіць?» (1902). Развіваючы вучэнне Маркса — Энгельса аб пралетарскай партыі, Ленін паказаў, што новая гістарычная эпоха патрабуе стварэння партыі новага тыпу, партыі сацыялістычнай рэвалюцыі і дыктатуры пралетарыяту, адметнай ад сацыял-дэмакратычнай партыі Заходняй Еўропы, якія пад уплывам апартуністычных лідэраў 2-га Інтэрнацыянала губляюць рэвалюцыйнасць, ператвараюцца ў партыі сацыяльных рэформ. Ён абгрунтаваў марксісцкае палажэнне, што партыя пралетарыяту — гэта спалучэнне рабочага руху з навук. сацыялізмам, вышэйшая форма класавай арг-цыі пралетарыяту, палітычнага кіраўніка, накіроўваючая сіла ў рабочым руху; раскрыў найважнейшае значэнне рэвалюц. тэорыі ў класавай барацьбе пралетарыяту, распрацаваў найважнейшыя прынцыпы і арганізац. прынцыпы партыі новага тыпу, яе задачы, якія былі ўвасоблены ў Праграме і Статуце партыі, што накрыставала рэд. «Искры» пры ўдзеле і пад кіраўніцтвам Леніна.

Перамогу ленінскага, іскраўскага кірунку ў рас. сацыял-дэмакратыі замацаваў *Другі з'езд РСДРП* [17(30).7—10(23).8.1903], які прыняў рэвалюц., марксісцкую праграму, разлічаную на перамогу дэмакр. і сацыялістычнай рэвалюцый. Гал. вынік II з'езду РСДРП у тым, што ён стварыў у Расіі марксісцкую пралет. партыю — партыю новага тыпу, у Праграме якой упершыню ў гісторыі міжнар. сацыялістычнага руху было патрабаванне дыктатуры пралетарыяту. Бальшавізм, які ўзнік як палітычны плынь, як палітычная партыя ў 1903, з'явіўся самым паслядоўна рэвалюц. кірункам у міжнар. рабочым руху.

На з'ездзе супраць ленінскай ідэі адзінай, цэнтралізаванай і строга дысцыплінаванай партыі выступілі апартуністы і ч. няўстойлівых іскраўцаў на чале з Мартавым. Вострая барацьба разгарэлася пры абмеркаванні § 1 Статута пра членства партыі. У процілегласць мартаўскай фармулёўцы Леніна патрабаваў асабістага ўдзелу чл. партыі ў рабоце парт. арг-цыі. Нязначнай большасцю галасоў § 1 Статута быў прыняты мартаўскі, адпаведна чаму ў іскраўцы дамагліся, што інш. палажэнні Статута прыняты ў рэд. Леніна і тым замацаваны расхаджанні ім арганіз. прынцыпы. Паслядоўнымі, рэвалюцыйнымі іскраўцамі былі У. І. Ленін, М. Э. Бауман, Л. С. Віленскі, У. П. Галкін, С. І. Гусеў, А. І. Зурабаў, Р. С. Землячка, Л. М. Кніповіч, Б. М. Кнунянц, П. А. Красікаў, М. М. Лядаў, Л. Д. Мальцман, Г. М. Міхайлаў, І. К. Ніжніцін, Г. В. Пляханаў, С. І. Сяпанаў, А. М. Стапанаў, Д. А. Таўгурыдзе, Дз. І. Ульянаў, А. В. Шотман. Прыхільнікі Леніна мелі большасць пры выбарах кіруючых органаў партыі і сталі наз. бальшавікамі (гл. *Бальшавізм*). Яны склалі рэвалюц., марксісцкае крыло партыі. Прыхільнікі Мартава, якія наз. меншавікамі (гл. *Меншавізм*), з'яўляліся апартуністычным крылом. Пасля II з'езду партыі меншавікі ўзялі курс на зрыў яго рашэнняў, дэзарганізацыю парт. работы. З дапамогай Пляханава, які перайшоў на пазіцыі апартунізму, яны захапілі цэнтр. орган, а потым і ЦК. Крытыку апартунізму меншавікоў у арганізац. пытаннях і далейшую распрацоўку вучэння пра партыю новага тыпу Ленін даў у кнізе «Крок уперад, два крокі назад» (1904). Абсалютная большасць мясцовых к-таў РСДРП, у т. л. Пецярбургскага і Палескі, згуртаваўшыся вакол бальшавікоў, стварылі свае *Бюро камітэтаў большасці* (БКБ) і газету «Вперед», пад кіраўніцтвам Леніна ўзялі курс на склікание III з'езду РСДРП.

Партыя бальшавікоў напярэдадні і ў гады першай рэвалюцыі ў Расіі (1904—07). Стварэнне бальшавіцкай партыі адкрыла новы этап у рас. і міжнар. рабочым руху. Яна ўзначаліла рэвалюц. барацьбу працоўных супраць самадзяржаўя і капіталізму. Сур'ёзным выпрабаваннем для партыі была *рэвалюцыя 1905—07 у Расіі*. Бальшавіцкі *Трэці з'езд РСДРП* [12—27.4(25.4—10.5).1905] вызначыў характар і задачы рэвалюцыі, распрацаваў тактыку партыі. Меншавікі адмовіліся ад удзелу ў з'ездзе і правялі сваю канфер., на якой вызначылі антымарксісцкую, апартуністычную палітыку ў рэвалюцыі, гегемонам якой лічылі буржуазію, адмаўлялі рэвалюц. магчымасці саюзніцтва. Тэарэт. абгрунтаванне тактычнай лініі бальшавікоў і крытыку пазіцыі меншавікоў Ленін даў у кнізе «Дзве тактыкі сацыял-дэмакратыі ў дэмакратычнай рэвалюцыі (1905), у якой паказаў асаблівасці і рухальныя сілы рэвалюцыі; абгрунтаваў гегемонію пралетарыяту і неабходнасць яго саюзу з сялянствам; даказаў, што гал. сродкам звяржэння самадзяржаўя з'яўляецца ўзбр. паўстанне, а сродкам развіцця рэвалюц. актыўнасці працоўных — масавая палітычная стачка; паказаў неабходнасць устанаўлення рэвалюц.-дэмакр. дыктатуры пралетарыяту і сялянства, часовага рэвалюц. ўраду; распрацаваў тэорыю перарастання бурж.-дэмакр. рэвалюцыі ў сацыялістычную. Ленін ідэйна разграміў меншавікоў, раскрыў беспадстаўнасць і шкоднасць т. зв. тэорыі «перманентнай рэвалюцыі» Троцкага. Ход рэвалюц. падзей паказаў правільнасць тактыкі бальшавікоў. *Кастрычніцкая ўсерасійская палітычная стачка 1905* паралізавала ўсю краіну. У ходзе яе ўзніклі Саветы рабочых дэп., у якіх Ленін убачыў зародак новай, рэвалюц. улады. Царызм вымушаны быў пайсці на ўступкі і выдаць Маніфест 17 кастрычніка, які абвясціў грамадзянскія свабоды, стварэнне Думы. Рэвалюцыя 1905—07 была генеральнай рэпетыцыяй Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917.



Камуністычная партыя Савецкага Саюза і. Пасяджэнне XXIV з'езду КПСС. 1971.



Камуністычная партыя Савецкага Саюза. Дэлегацыя КПБ на XXIV з'ездзе КПСС з кіраўнікамі партыі і ўрада. 1971.

фест 17 кастрычніка 1905 з ілжывымі абяцаннямі некаторых свабод. Бальшавікі кіравалі рэвалюц. барацьбой працоўных, якая найвышэй узнялася ў час *Снежаньскага ўзброенага паўстання 1905*. Царызм задушыў выступленні рабочых і сялян, аднак, побач з рэпрэсіямі, ён стаў манеўраваць і аб'явіў скліканне Дзярж. думы. У інтарэсах рэвалюцыі неабходна было пераадолець раскол РСДРП, згуртаваць сілы пралетарыяту.

10—25.4(23.4—8.5).1906 адбыўся *Чацвёрты (Аб'яднаўчы) з'езд РСДРП*, на якім прысутнічалі бальшавікі, меншавікі, прадстаўнікі Бунду, нац. с.-д. арг-цый Польшчы, Літвы, Латышскага краю. На з'ездзе ішла востpая барацьба па праграмных, тактычных і арганіз. пытаннях. Па агр. пытанні Ленін абараняў марксісцкую праграму нацыяналізацыі зямлі (гл. *Аграрная праграма КПСС*), але меншавікі, якія мелі большасць галасоў, правялі шкодную праграму муніцыпалізацыі зямлі. З'езд прыняў у РСДРП нац. с.-д. арг-цыі, што адпавядала прынцыпу пралетарскага інтэрнацыяналізму, зацвердзіў ленінскую фармулёўку § 1 Статута, аб'явіў аб'яднанне бальшавікоў з меншавікамі ў адзінай РСДРП, хоць аб'яднанне было фармальнае. У абставінах спаду рэвалюцыі адбыўся *Пяты (Лонданскі) з'езд РСДРП* [30.4—19.5(13.5—1.6).1907], на якім пераважалі бальшавікі. З'езд вызначыў задачы думскай фракцыі партыі; распрацаваў тактыку ў адносінах да непралетарскіх партый (чарнасоценцаў, акцябрыстаў, кадэтаў, эсэраў і трудавікоў); адхіліў меншавіцкую ідэю стварэння «шырокай рабочай партыі»; вызначыў задачы партыі ў прафсаюзах. Першая рус. рэвалюцыя пацярпела паражэнне, але яна мела велізарнае гістар. значэнне: пахіснула ўстоі царызму, узброіла нар. масы і партыю бальшавікоў вопытам рэвалюц. барацьбы, дала магутны штуршок нац.-вызв. руху ў Еўропе і Азіі.

Партыя ў перыяд рэакцыі (1907—10). Сталыпінская рэакцыя паставіла партыю бальшавікоў і рабочы клас перад цяжкімі выпрабаваннямі. З прычыны масавых рэпрэсій рэзка скарацілася колькасць парт. арг-цый. З усіх разбітых партый бальшавікі праявілі найб. вытрымку, вернасць пралетарыяту, адступалі арганізавана, выпрацоўвалі новыя формы паліт. і арганіз. работы, рыхтавалі масы да рашучых бітваў з царызмам.

Меншавікі адступалі ў паніцы, многія іх лідэры патрабавалі ліквідацыі нелегальнай партыі і прымірэння з чарнасоценным рэжымам. *Ліквідатарства* фактычна падтрымліваў Троцкі, які выступіў з пазіцый цэнтрызму, адмаўляў прынцыповы характар разыходжанняў паміж бальшавікамі і меншавікамі. У радах бальшавікоў з'явіліся апартуністы «злева» — *адзавісты* і ультыматысты, якія выступілі супраць выкарыстання легальных формаў работы ў масах. Важную ролю ў барацьбе супраць ліквідатараў, адзавістаў, трацкістаў, у распрацоўцы новай тактыкі, разлічанай на захаванне і збіранне сіл для новага рэвалюц. ліку, спалучэнне нелегальных формаў парт. работы з легальнымі, адыгралі *Пятая канферэнцыя РСДРП* (Агульнарасійская) [21—27.12.1908 (3—9.1.1909)] і *Нарада расшыранай рэдакцыі «Пролетария»* (1909). Бальшавікі разгарнулі барацьбу супраць рэакцыі на ідэалаг. фронце. Выдатную ролю ў абароне і творчым развіцці марксісцкай філасофіі — тэарэт. аснову партыі бальшавікоў адыграла кніга Леніна «Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм» (1909).

Партыя ў перыяд новага рэвалюцыйнага ўздыму (1910—14). Ажыўленне рабочага руху, якое ў 1912 перарасло ў новы рэвалюц. ўздым, дало магчымасць бальшавікам адмежавацца ад апартуністаў не толькі ідэйна, але і арганізацыйна. Гэтую задачу выканала *Шостая (Пражская) Усерасійская канферэнцыя РСДРП* [5—17(18—30).1.1912], на якой меншавікі-ліквідатары выключаны з партыі, выбраны бальшавіцкі ЦК на чале з Леніным. Ва ўмацаванні партыі, расшырэнні сувязі з масамі, паліт. выхаванні працоўных важную ролю адыгралі яе легальныя органы — газ. *«Правда»* і *бальшавіцкая фракцыя 4-й Дзяржаўнай думы*. Партыя ўзначаліла рэвалюц. ўздым. Да лета 1914 стачачная барацьба пралетарыяту набыла велізарны размах, краіна ішла да новай рэвалюцыі. Партыя распрацоўвала найважнейшыя пытанні праграмы, стратэгіі і тактыкі. У творах «Крытычныя заметкі па нацыянальным пытанні» (1913), «Аб праве нацый на самавызначэнне» (1914) Ленін абгрунтаваў гал. патрабаванні нац. праграмы партыі: права нацый на самавызначэнне, поўнае раўнапраўе нацый, прынцып пралетарскага інтэрнацыяналізму. Бальшавікі змагаліся супраць шавінізму і бурж. нацыяналізму, згуртоўвалі працоўных многанацыянальнай Расіі на барацьбу з царызмам і капіталізмам, рашуча абаранялі прынцыпы рэвалюц. марксізма і пралетарскага інтэрнацыяналізму ў сусв. рабочым руху, аб'ядноўвалі левыя сілы супраць пагрозы імперыял. вайны.

Партыя ў перыяд 1-й сусветнай вайны. Другая рэвалюцыя ў Расіі (1914 — люты 1917). 1-я сусв. вайна была крутым паваротам у жыцці многіх народаў. Лідэры большасці партый 2-га Інтэрнацыянала канчаткова здрадзілі прынцыпу пралетарскага інтэрнацыяналізму, над фальшывым лозунгам «абароны айчыны» заклікалі працоўных падтрымліваць «свае» імперыял. ўрады, скаціліся на пазіцыі сацыял-шавінізму. 2-і Інтэрнацыянал ганебна распаўся, што было цяжкім ударам па міжнар. рабочым руху. На пазіцыі сацыял-шавінізму сталі і рус. меншавікі. Толькі партыя бальшавікоў на чале з Леніным асталася вернай пралетарскаму інтэрнацыяналізму, распрацавала дакладную марксісцкую платформу па пытаннях вайны і міру. Бальшавікі заклікалі рабочых да барацьбы за ператварэнне вайны імперыял. у грамадзянскую, за паражэнне ў вайне свайго імперыял. ўрада. Яны паказалі неабходнасць разрыву з сацыял-шавіністамі і згуртавання левых, інтэрнацыяналісцкіх сіл для стварэння 3-га, *Камуністычнага Інтэрнацыянала*. У гэты перыяд Ленін унёс вялікі ўклад у даследаванне імперыялізму і распрацоўку тэорыі сацыяліст. рэвалюцыі. У творах «Імперыялізм, як вышэйшая стадыя капіталізму» (1916, апубл. 1917), «Аб лозунгу Злучаных Штатаў Еўропы» (1915), «Военная праграма пралетарскай рэвалюцыі» (1916, апубл. 1917) ён адкрыў закон нераўнамернасці эканам. і паліт. развіцця капіталізму ў эпоху імперыя-

лізму і зрабіў вывад пра магчымасць перамогі сацыялісг. рэвалюцыі першапачаткова ў некалькіх або нават у адной, асобна ўзятай краіне; распрацаваў вучэнне пра рэвалюц. сітуацыю, аб'ектыўныя і суб'ектыўныя перадумовы рэвалюцыі.

Ленінская тэорыя і тактыка па пытаннях вайны, міру і рэвалюцыі з'явілася трывалай базай, на якой партыя вяла рэвалюц. выхаванне мас. На пач. 1917 у Расіі стварылася рэвалюц. сітуацыя. Бальшавікі заклікалі працоўных да ўзбр. паўстання. 27.2.1917 царызм у Расіі быў звергнуты, *Лютаўская буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя 1917* перамагла. У краіне ўзнікла *двоеўладдзе*: Саветы рабочых і салдацкіх дэп.— органы рэвалюц.-дэмакр. дыктатуры пралетарыяту і сялянства і Часовы ўрад — орган дыктатуры буржуазіі. Гэта адбылося ў выніку недастатковай арганізаванасці і палітг. свядомасці пралетарыяту і сялянства, іх даверлівасці да дробнабурж. партый меншавікоў і эсэраў, якія атрымалі большасць у Саветах і памаглі буржуазіі стварыць Часовы ўрад; у выніку таго, што бальшавіцкія арг-цыі былі абяскроўлены вайною і рэпрэсіямі, Лют. рэвалюцыя стварыла ўмовы пераходу да новага, сацыяліст. этапа рэвалюцыі.

Партыя бальшавікоў — натхняцель і арганізатар перамогі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі (сак.— кастр. 1917). Пасля Лют. рэвалюцыі бальшавікі выйшлі з падполля. Новая арыенціроўка партыі, стратэгічны план пераходу да сацыяліст. рэвалюцыі распрацаваны ў *Красавіцкіх тэзісах У. І. Леніна* і ў рашэннях *Сёмай (Красавіцкай) Усерасійскай канферэнцыі РСДРП(б)* [24—29.4 (7—12.5).1917]. Партыя брала курс на мірнае развіццё рэвалюцыі пад лозунгамі «Уся ўлада Саветам!», «Ніякай падтрымкі Часоваму ўраду!». Курс быў разлічаны на тое, каб шляхам агіт. работы ў масах, выкрыцця згодніцкіх партый завяваць у Саветах большасць і ўстанавіць дыктатуру пралетарыяту.

Згуртаваўшыся на ленінскай платформе, партыя разгарнула паліт. і арганіз. работу ў Саветах, салдацкіх к-тах, прафсаюзах па завяванні мас. Магутныя дэманстрацыі пратэсту супраць антынароднай палітыкі Часовага ўрада адбыліся ў крас. і чэрв. (гл. *Красавіцкі крызіс 1917, Чэрвеньскі крызіс 1917*). Аднак пасля *Ліпеньскіх дзён 1917* паліт. становішча ў краіне рэзка змянілася. Аналіз яго Ленін даў у работах «Палітычнае становішча» і «Да лозунгаў». Ён паказаў, што двоеўладдзе кончылася і ўлада цалкам перайшла ў рукі буржуазіі, у лагер якой адкрыта перайшлі меншавікі і эсэры. Саветы ператварыліся ў дадатак да бурж. ўрада. Магчымасць мірнага развіцця рэвалюцыі зніклa, уладу ў буржуазіі можна было ўзяць толькі ўзбр. шляхам. *Шосты з'езд РСДРП(б)* [26.7—3.8(8—16.8).1917] часова зняў заклік «Уся ўлада Саветам!», узяў курс на падрыхтоўку ўзбр. паўстання для ўстанаўлення дыктатуры пралетарыяту.

Буржуазія таксама збірала сілы, каб задушыць рэвалюцыю і ўстанавіць ваен. дыктатуру. Контрэвалюц. змову ўзначаліў ген. Карнілаў. Разгром карнілаўшчыны рэвалюц. рабочымі і салдатамі ўзняў аўтарытэт бальшавікоў сярод працоўных, што яркa праявілася ў бальшавізацыі Саветаў. Адчуў устанаўленне дыктатуры пралетарыяту праз узбр. паўстанне. Напярэдадні Кастрычніка ў партыі было калі 300 тыс. чл., аб'яднаных у 348 раённых, 334 гар., 24 губ. і 12 абл. арг-цыях, выдавалася калі 80 газет. Пад кіраўніцтвам Леніна яна сканцэнтравала сілы на падрыхтоўцы ўзбр. паўстання. У пісьмах і артыкулах Леніна «Бальшавікі павінны ўзяць уладу», «Марксізм і паўстанне», «Крызіс наспеў», «Парады пастаронняга» і інш. распрацаваны паліт. і ваен.-аператыўны план паўстання. Гістар. рашэнні ЦК РСДРП(б) ад 10(23) і 16(29).10.1917 аб узбр. паўстанні былі дырэктывай для ўсёй партыі. 25.10(7.11).1917 паўстанне ў Петраградзе перамагло, Часовы ўрад скінуты, улада перайшла да ВРК пры Петраградскім Савеце. Другі *Усерасійскі з'езд Саветаў*, на якім пераважалі бальшавікі, замацаваў перамогу пралетарыяту і завяваў пра пераход улады да Саветаў. Ён прыняў *Дэкрэт аб міры* і *Дэкрэт аб зямлі*, выбраў вышэйшы орган Сав. дзяржавы — ВЦВК, утварыў першы Савецкі ўрад — СНК на чале з Леніным. Услед за Петраградам дыктатура пралетарыяту ў форме Саветаў устанавілася па ўсёй краіне.

Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя перамагла. Натхняцелем і арганізатарам гэтай перамогі была ленінская партыя бальшавікоў, якая, апіраючыся на саюз рабочага класа і сялянства, аб'яднала і накіравала да адзінай мэты розныя рэвалюц. патокі: сацыяліст. рух пралетарыяту за звяржэнне буржуазіі, рэвалюц. барацьбу сялян супраць памешчыкаў, нац.-вызв. рух, усенародную барацьбу за мір. Кастр. рэвалюцыя адкрыла эпоху ўсеагульнага рэвалюц. абнаўлення свету, эпоху пераходу ад капіталізму да сацыялізма.

Барацьба партыі за развіццё сацыялістычнай рэвалюцыі і ўмацаванне Савецкай улады (ліст. 1917 — ліп. 1918). Пасля перамогі Кастр. рэвалюцыі бальшавіцкая партыя стала правячай. Яна ўзначаліла барацьбу працоўных за пабудову сацыяліст. грамадства. Пад кіраўніцтвам партыі рабочы клас у саюзе з беднейшым сялянствам адбіў шматлікія атакі контррэвалюцыі, умацаваў сваё паліт. панаванне, авалодваў камандным вышынямі ў эканоміцы.

Быў зламаны стары бурж.-памешчыцкі дзярж. апарат і створаны новы; нацыяналізаваны буйныя прадпр., чыгункі, банкі; ажыццяўляўся Дэкрэт аб зямлі. Для кіравання нар. гасп. створаны ВСНГ, барацьбу з контррэвалюцыяй узначаліла ВЧК. *Дэкларацыя правоў народаў Расіі* устанавіла рэальнае і свабоднае развіццё ўсіх народаў краіны. Ліквідаваны саслоўны падзел, царква аддучана ад дзяржавы, а школа ад царквы, жанчына атрымала аднолькавыя правы з мужчынам. *Трэці Усерасійскі з'езд Саветаў* прыняў ленінскую *Дэкларацыю правоў працоўнага і эксплуатуемага народа* — першы канстытуцыйны акт Сав. дзяржавы. Для абароны заваёў Кастрычніка стваралася Чырв. Армія. Партыя і Сав. ўрад з першых дзён перамогі Кастрычніка рабілі захады, каб вывесці краіну з вайны, але імперыял. ўрады дзяржаў Антанты адмовіліся ад перагавораў пра мір. Насупраць «левым камуністам» і здрадніцкай пазіцыі Троцкага партыя на чале з Леніным дамаглася падпісання *Брэсцкага міру 1918*.

Сёмы з'езд РКП(б) (экстраны, 6—8.3.1918) ухваліў падпісанне міру; перайменаваў партыю ў Расійскую камуніст. партыю (бальшавікоў) — РКП(б); у сувязі з выкананнем 1-й Праграмы партыі (1903) прыняў рэзалюцыю пра распрацоўку новай Праграмы і стварыў для гэтага камісію на чале з Леніным. У мірных умовах партыя сканцэнтравала ўвагу на задачах гасп. буд-ва. У працах «Чарговыя задачы Савецкай улады», «Галоўная задача нашых дзён» і інш. Ленін распрацаваў план буд-ва асноў сацыяліст. эканомікі, навук. прынцыпы эканам. палітыкі партыі і Сав. дзяржавы. Партыя пачала ажыццяўляць ленінскі план. Вял. ўвагу аддавала яна парт. і дзярж. буд-ву ў нац. раёнах краіны. На працягу 1918 у сувязі з утварэннем нац. сав. рэспублік створаны кампартыі Туркестана, Украіны, Літвы, якія з'яўляліся састаўнымі часткамі РКП(б). 30—31.12.1918 у Смаленску праходзіла VI Паўн.-Зах. абласная канфер. РКП(б), якая прыняла пастанову пра абвяшчэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі і аб'явіла сябе *Першым з'ездам КП(б)Б*.

Партыя ў перыяд замежнай ваеннай інтэрвенцыі і грамадзянскай вайны (1918—20). У гады *грамадзянскай вайны і ваеннай інтэрвенцыі ў СССР 1918—20* партыя на чале з Леніным узняла працоўных на абарону заваёў рэвалюцыі, распрацавала праграму абароны краіны, арганізацыі Узбр. Сіл. У агні грамадз. вайны загартавалася Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія (РСЧА). Каб мабілізаваць рэсурсы і сілы краіны для перамогі над ворагам, уведзена палітыка *ваеннага камунізма*, створаны Савет Рабочай і Сялянскай Абароны.

Усе найважнейшыя пытанні палітыкі партыі і Сав. дзяржавы, ваен. аперацыі разглядаліся на парт. з'ездах, пленумах ЦК, пасяджэннях Палітбюро ЦК РКП(б). Праводзіліся масавыя мабілізацыі камуністаў на фронт, з 600 тыс. чл. партыі палавіна знаходзілася ў Чырв. Арміі. Самыя важныя ўчасткі ўзначальвалі паплечнікі і вучні Леніна: А. А. Андрэеў, У. А. Антонаў-Аўсеенка, Р. К. Арджанікідзе, А. С. Бубнаў, С. І. Гусеў, Ф. Э. Дзяржынскі, М. І. Калінін, С. М. Кіраў, С. В. Касіёр, Л. Б. Красін, Г. М. Кржыжаноўскі, В. У. Куйбышаў, Дз. З. Мануільскі, А. І. Мікаян, А. Ф. Мяснікоў, М. І. Падвойскі, П. П. Постышаў, Р. І. Пятроўскі, Я. М. Свярдлоў, І. В. Сталін і інш. З нар. мас выйшлі легендарныя палкаводцы У. М. Азін, В. К. Блюхер, С. М. Будзённы, К. Я. Варашылаў, Р. І. Катоўскі, С. Г. Лазо, А. Я. Пархоменка, М. М. Тухачэўскі, І. П. Убарэвіч, Я. Ф. Фабрыцыус, М. В. Фрунзе, В. І. Чапаеў, М. А. Шчорс і інш.

Восьмы з'езд РКП(б) (18—23.3.1919) прыняў другую Праграму партыі — праграму пабудовы сацыялізма, вызначыў задачы пераходнага перыяду ў галінах эканомікі, культуры, сац. і нац. адносін; абвясціў новы лозунг партыі па сялянскім пытанні — трывалы саюз з серадняком пры апоры на беднату для барацьбы з кулакамі; прыняў важныя рашэнні пра парт. буд-ва, Чырв. Армію. *Дзевяты з'езд РКП(б)* (29.3—5.4.1920) намеціў чарговыя задачы гасп. буд-ва, аднаўлення транспарту, паліўнай прамысл., надаваў асаблівую ўвагу адзінаму гасп. плану на аснове электрыфікацыі краіны.

Пад канец 1920 асн. сілы інтэрвентаў і белагвардзейцаў былі разгромлены. Краіна Саветаў выстаяла і перамагла таму, што РКП(б) забяспечыла ваен.-паліт. саюз рабочага класа і працоўнага сялянства, аб'яднала ваен. і эканам. намаганні ўсіх сав. рэспублік для разгрому ворагаў. РКП(б) выступіла ініцыятарам стварэння ў сак. 1919 Камінтэрн. Інтэрнацыянала, змагалася за чысціню марксісцка-ленінскай тэорыі, адзінства і згуртаванасць міжнар. камуніст. і рабочага руху. Велізарнае значэнне для маладых камуніст. партый свету мела кніга Леніна «Дзіцячая хвароба «левізны» ў камунізме», якая ўзброіла іх вопытам бальшавізму, правільнай стратэгіяй і тактыкай.

Камуністычная партыя ў барацьбе за аднаўленне і перабудову народнай гаспадаркі краіны на аснове новай эканамічнай палітыкі (1921—25). Пасля выгнання інтэрвентаў і пераможнага заканчэння грамадз. вайны партыя сканцэнтравала намаганні на аднаўленні нар. гаспадаркі. *Дзесяты з'езд РКП(б)* (8—16.3.1921) прыняў *новую эканамічную палітыку* (нэп), якая была разлічана на пераадоленне разрухі, стварэнне фундамента сацыяліст. эканомікі, развіццё буйной прамысл., устанаўленне эканам. змычкі паміж горадам і вёскай, умацаванне саюзу рабочага класа і сялянства, на ліквідацыю капіталіст. элементаў, на перамогу сацыялізма. З'езд выказаўся за добраахвотны дзярж. саюз сав. рэспублік, паставіў задачу ліквідаваць гасп. і культ. адсталасць прыгнечаных у мінулым народаў краіны, замацаваў перамогу ленінскай лініі ў дыскусіі аб прафсаюзах, прыняў рэзалюцыю «Аб адзінстве партыі».

Першыя вынікі аднаўлення нар. гасп. на аснове нэпа падвёў *Адзінаццаты з'езд РКП(б)* (27.3—2.4.1922). Ён паставіў задачы перагрупаваць сілы для наступлення на капіталіст. элементы, навучыцца гаспадарыць, культурна гандляваць; устанавіў пасаду Генеральнага сакратара ЦК і выбраў на яе І. В. Сталіна. 30.12.1922 па ініцыятыве Леніна створаны *Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік* — многанац. дзяржава новага тыпу. Кампартыі нац. рэспублік увайшлі ў адзіную РКП(б) на правах яе абл. арг-цый. У сваіх апошніх артыкулах, прамовах і пісьмах (1922—23) Ленін закончыў распрацоўку плана пабудовы сацыялізма ў СССР, які прадугледжваў індустрыялізацыю краіны, калектывізацыю с. гасп., культурную рэвалюцыю. Важныя рашэнні пра развіццё прамысловасці, с. гасп., гандлю, удасканаленне дзярж. апарату, умацаванне адзінства партыі, па нац. пытанні прыняў *Дванаццаты з'езд РКП(б)* (17—25.4. 1923). Скарыстаўшы хваробу і смерць (21.1. 1924) Леніна, Троцкі ў 1923—24 працягваў антыпарт. дзейнасць: чарніў парт. кадры, патрабаваў «свабоды» фракцый у партыі, фальсіфікаваў гісторыю бальшавізму. *Трынаццатая канферэнцыя РКП(б)* (16—18.1.1924) і *Трынаццаты з'езд РКП(б)* (23—31.5.1924) кваліфікавалі троцкізм як дробнабурж. ўхіл у партыі. З'езд разгледзеў пытанні пра ўнутраны гандаль і кааперацыю, работу ў вёсцы, парт. буд-ва, даў дырэктывы павялічыць выпуск металу, узмацніць каапераванне сялян. *Чатырнаццатая канферэнцыя РКП(б)* (27—29.4. 1925) зрабіла законам для партыі ленінскі вывад пра магчымасць пабудовы сацыялізма ў СССР, растлумачыла пытанне пра поўную і канчатковую перамогу сацыялізма. Гэтую лінію партыі замацаваў *Чатырнаццаты з'езд ВКП(б)* (18—31.12.1925), які разгледзеў «новую апазіцыю» Зіноўева — Каменева, падвёў вынікі аднаўлення нар. гасп., абараніў ленінскі план пабудовы сацыялізма ў СССР, узяў курс на сацыяліст. індустрыялізацыю — аснову ўзмацнення абароназдольнасці краіны, перайменаваў РКП(б) ва Усесаюзную Камуністычную партыю (бальшавікоў) [ВКП(б)].

Барацьба партыі за сацыялістычную індустрыялізацыю краіны і калектывізацыю сель-

скай гаспадаркі. Стварэнне фундамента сацыялізма ў СССР (1926—32). Індустрыялізацыю краіны партыя і сав. народ праводзілі ва ўмовах варожага капіталіст. акружэння, пастаяннай пагрозы нападу агрэсіўных сіл імперыялізму, у гранічна сціслыя тэрміны, пры напружанні ўсіх сіл і сродкаў. Цяжкасці ўскладняліся выступленнямі апазіцыянераў, якія летам 1926 аб'ядналіся ў трацкісцка-зіноўеўскі антыпарт. блок. *Пятнаццатая канферэнцыя ВКП(б)* (26.10—3.11.1926) характарызавала гэтую платформу як с.-д. ўхіл у партыі, сур'ёзна папярэдзіла апазіцыянераў. Пасля новай дыскусіі, у ходзе якой антыпарт. блок пацярпеў поўнае паражэнне, Троцкі і Зіноўеў за антыпарт. і антысав. дзейнасць выключаны з партыі. *Пятнаццаты з'езд ВКП(б)* (2—19.12.1927), кіруючыся ленінскім кааператыўным планам, прыняў рашэнне пра калектывізацыю с. гасп. ў СССР, сарыентаваў партыю на падрыхтоўку наступлення сацыялізма па ўсім фронце, зацвердзіў дырэктывы аб складанні 1-га пяцігадовага плана развіцця нар. гаспадаркі. З'езд падагуліў шматгадовую барацьбу партыі з трацкізмам, адзначыў, што трацкісцка-зіноўеўскі блок парваў з ленінізмам, стаў зброяй класавых ворагаў, і выключыў з партыі актыўных апазіцыянераў.

Неўзабаве ў партыі ўтварылася праваапартуністычная група Бухарына, Рыкава, Томскага, якая выступала супраць калектывізацыі с. гасп., надзвычайных мер да кулакоў. *Шаснаццатая канферэнцыя ВКП(б)* (23—29.4.1929) асудзіла погляды правых апартуністаў, прыняла 1-ы пяцігадовы план развіцця нар. гасп. СССР (1928—33), разлічаны на пабудову фундамента сацыялізму, эканомікі, заклікала працоўных разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва. Курс партыі паспяхова ажыццяўляўся: бурна развівалася прамысл., разгарнуўся масавы калектывізацыя с. гаспадаркі. Пастанова ЦК ВКП(б) 5.1.1930 «Аб тэмпе калектывізацыі і мерах дапамогі дзяржавы калгаснаму будаўніцтву» вызначыла тэрміны заканчэння калектывізацыі ў розных раёнах краіны і яе асн. форму — сельгасарцель, паставіла задачы ліквідаваць кулацтва як клас, паскорыць буд-ва заводаў па выпуску с.-г. машын, стварэнне МТС, саўгасаў. Аднак лінія партыі ў калг. буд-ве ў шэрагу месцаў скрыўлялася, празмерна паскараліся тэмпы, парушаўся прынцып добраахвотнасці, што выклікала незадаволенасць сялян. ЦК ВКП(б) 14.3.1930 прыняў пастанову «Аб барацьбе са скрыўленнямі партлініі ў калгасным руху». Паслядоўнае ажыццяўленне палітыкі партыі ў вёсцы прывяло да новага ўздыму калектывізацыі.

Шаснаццаты з'езд ВКП(б) (26.6—13.7.1930) увайшоў у гісторыю як з'езд разгорнутага наступлення сацыялізма па ўсім фронце. Ён даў характарыстыку міжнар. і ўнутр. становішча СССР, адзначыў поспехі індустрыялізацыі, значэнне калектывізацыі с. гасп. для перамогі сацыялізма, вызначыў задачы прафсаюзаў у перыяд рэканструкцыі нар. гасп., праграму культ. буд-ва. Партыя звярнула гал. ўвагу на паскарэнне тэмпаў сацыяліст. буд-ва, рэканструкцыю нар. гасп. на базе новай тэхнікі, развіццё творчай ініцыятывы і актыўнасці працоўных — усенароднага руху наватараў і ўдарнікаў вытворчасці, узначаліла паход за авалоданне тэхнікай. *Семнаццатая канферэнцыя ВКП(б)* (30.1—4.2.1932) адзначыла паспяховае ажыццяўленне палітыкі індустрыялізацыі і калектывізацыі і прыняла дырэктывы аб складанні 2-га пяцігадовага плана. 1-я пяцігодка была выканана датэрмінова — за 4 гады і 3 месяцы. СССР ператварыўся з аграрнай краіны ў індустрыяльную, на вёсцы перамог калгасны лад. Пад кіраўніцтвам партыі сав. народ пабудаваў трывалы фундамент сацыялізма.

Барацьба партыі за заканчэнне сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі. Перамога сацыялізма ў СССР (1933—37). *Сямнаццаты з'езд ВКП(б)* (26.1—10.2.1934) прыняў рэалюцыю пра 2-і пяцігадовы план развіцця нар. гасп. СССР на 1933—37. Асн. паліт. задача пяцігодкі — канчатковая ліквідацыя ў краіне капіталіст. элементаў і прычын, якія іх спараджаюць; асн. гасп. задача — заканчэнне тэхн. рэканструкцыі ўсёй нар. гаспадаркі. Выкананне 2-й пяцігодкі забяспечыла перамогу сацыялізма ў СССР. Эксплуататарскія класы былі цалкам ліквідаваны, усталявалася сацыяліст. ўласнасць на сродкі вытв. ў дзвюх яе формах — агульнанар. і калг.-каап.; склалася сацыяльна-паліт. і ідэйнае адзінства сав. грамадства: рабочага класа, калг. сялянства і нар. інтэлігенцыі. Сфарміраваліся новыя, сацыяліст. нацыі, у т. л. беларуская, умацавалася дружба народаў СССР. У выніку самаадданай працы сав. народа, тэарэт. і практычнай дзейнасці ВКП(б) чалавецтва атрымала сацыяліст. грамадства і праверануо на практыцы навуку пра буд-ва сацыялізма. Перамога сацыялізма заканадаўча замацавана ў *Канстытуцыі СССР*, прынятай 5.12.1936 Надзвычайным VIII з'ездам Саветаў.

Дзейнасць партыі па ўмацаванні сацыялістычнага грамадства і абараназдольнасці краіны (1937 — чэрв. 1941). Забяспечыўшы перамогу сацыялізма, партыя сканцэнтравала намаганні сав. народа на ўмацаванні мат.-тэхн. базы сацыялізма, калг. ладу, на далейшым развіцці сав. дэмакратыі. *Васемнаццаты з'езд ВКП(б)* (10—21.3.1939) абвясціў пра ўступленне СССР у палосу заканчэння буд-ва сацыяліст. грамадства і паступовага пераходу ад сацыялізма да камунізма, практычна паставіў пытанне пра асн. эканам. задачу СССР — дагнаць і перагнаць гал. капіталіст. краіны па вытворчасці прадукцыі на душу насельніцтва, прыняў рэалюцыю пра 3-і пяцігадовы план развіцця нар. гасп. СССР (1938—42). Важнымі гістар. вехамі з'явілася ўз'яднанне бел., укр. і малд. народаў, аднаўленне Сав. улады ў прыбалтыйскіх рэсп. і ўваходжанне іх у СССР. 3-я пяцігодка ажыццяўлялася ва ўмовах 2-й сусв. вайны (1939—45), пастаяннай небяспекі імперыял. агрэсіі. Партыя і Сав. ўрад рабілі захады па ўмацаванні абараназдольнасці краіны, яе эканам. магутнасці, стварэнні сістэмы калектыўнай бяспекі. *Васемнаццатая Усесаюзная канферэнцыя ВКП(б)* (15—20.2.1941) прыняла рашэнні пра паляпшэнне работы прамысл. і транспарту, накіраваныя на ўмацаванне абароннай магутнасці краіны.

Партыя ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны (1941—45). 22.6.1941 фаш. Германія вераломна напала на СССР. Пачалася *Вялікая Айчынная вайна Савецкага Саюза 1941—45*, якая злілася з барацьбой усіх свабадалюбівых народаў супраць фашызму. Камуніст. партыя ўзняла на абарону Радзімы ўвесь народ. Праграма арганізацыі адпору агрэсару выкладзена 29.6.1941 у дырэктыве СНК СССР і ЦК ВКП(б) парт. і сав. арг-цыям. 30.6.1941 створаны *Дзяржаўны камітэт абароны* на чале з Сталіным. ЦК кампартый саюзных рэсп., крайкомы, абкомы, гаркомы і райкомы партыі ўзначалілі барацьбу за ажыццяўленне праграмы, распрацаванай ЦК ВКП(б). Праведзена эвакуацыя ў сав. тыл насельніцтва, прамысл. прадпр., дзярж. і калг.-каап. маёмасці; нар. гасп. перабудавана на ваенны лад; краіна ператворана ў адзіны баявы лагер. Гал. ўвага звернута на ўмацаванне Узбр. Сіл. У выніку велізарнай арганіз. і паліт. работы партыі пераадолены цяжкасці першага перыяду вайны, забяспечаны пералом у ходзе вайны, найважнейшымі этапамі якога з'явіліся Маскоўская, Сталінградская і Курская бітвы. Партыя выступіла арганізатарам камуніст. падполля і партыз. руху на часова акупаванай тэрыторыі. ЦК ВКП(б) 18.7.1941 прыняў пастанову «Аб арганізацыі барацьбы ў тыле германскіх войск», 30.5.1942 стварыў *Цэнтральны штаб партызанскага руху* на чале з П. К. Панамарэнкам, штабы партыз. руху ў акупаваных ворагам рэсп. і абласцях. На захопленай ворагам тэр. дзейнічала шырокая сетка камуністычнага падполля, у 1943 налічвалася больш за 1 млн. узброеных партызан (гл. *Партыйнае падполле ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Партызанскі рух у Вялікай Айчыннай вайне 1941—45, Антыфашысцкія арганізацыі*). У 1944 ням.-фаш. захопнікі выгнаны з тэр. СССР. Сав. Армія адыграла гал. ролю ў вызваленні ад фаш. акупацыі народаў Аўстрыі, Албаніі, Балгарыі, Венгрыі, Нарвегіі, Польшчы, Румыніі, Чэхаславакіі, Югаславіі.

У ходзе вайны склалася антыгітлераўская кааліцыя, аднак СССР і яго Узбр. Сілы вынеслі асн. цяжар вайны, адыгралі вырашальную ролю ў перамозе над гітлераўскай Германіяй, а потым і над мілітарысцкай Японіяй. Камуніст. партыя з'явілася натхняльнікам і арганізатарам перамогі сав. народа ў Вял. Айч. вайне. Яна сапраўды была партыяй-змагаром. У канцы вайны ў арміі знаходзілася 3325 тыс. камуністаў, або 60% складу партыі, больш чым 3 млн. камуністаў загінулі на франтах. Баявым штабам партыі быў яе ЦК, які ўзначальваў Сталін. У кіраўніцтве краінай і арміяй прымалі ўдзел відныя парт. і дзярж. дзеячы, у т. л. А. А. Андрэеў, Л. І. Брэжнеў, М. А. Вазнясенскі, К. Я. Варашылаў, А. А. Жданаў, М. І. Калінін, А. М. Касыгін, А. П. Кірыленка, О. В. Куусінен, Дз. З. Мануільскі, В. П. Мжаванадзе, А. І. Мікаян, П. К. Панамарэнка, А. С. Шчарбакоў і інш. Перамога СССР над гітлераўскай Германіяй мела сусв.-гістар. значэнне, зрабіла дабратворны ўплыў на ўвесь ход грамадскага развіцця. Сусв. цывілізацыя была выратавана ад фаш. варварства.

Барацьба партыі за аднаўленне народнай гаспадаркі і далейшае развіццё сацыялістычнага грамадства (1946—58). Дзейнасць кампартыі па мабілізацыі працоўных на аднаўленне разбуранай вайной нар. гасп., на далейшым развіцці і ўмацаванні сацыяліст. грамадства праходзіла ў абставінах змены суадносін сіл у свеце на карысць сацыялізма. У шэрагу краін Еўропы і Азіі перамаглі сацыяліст. рэ-

валюцыі, стварылася сусветная сістэма сацыялізма. Нарастаў рэвалюц. рабочы і нац.-вызв. рух. КПСС разам з інш. братнімі партыямі зрабіла вялікі ўклад у стварэнне і ўмацаванне садружнасці сацыяліст. нацый, згуртаванне міжнароднага камуніст. руху, у барацьбу за мір, супраць імперыял. рэакцыі, якая на чале з ЗША праводзіла палітыку «з пазіцыі сілы», развязала «халодную вайну».

У 1946 прыняты 4-ы пяцігадовы план, асн. гасп.-паліт. задача якога — аднавіць прамысл. і с. гасп. ў разбураных раёнах краіны і значна перавысіць гэты ўзровень. Нягледзячы на велізарныя людскія і матэрыяльныя страты, нанесеныя вайною, у 1948 прамысл. вытворчасць краіны перасягнула даваенны ўзровень. 4-я пяцігодка выканана датэрмінова. С. гасп. наблізілася да перадваен. ўзроўню. У 1949—50 праведзена калектывізацыя с. гасп. ў вах. абласцях Беларусі і Украіны, у Латвіі, Літве, Эстоніі. У канцы 1947 адменена картачная сістэма, уведзеная ў вайну, павысіўся дабрабыт працоўных. КПСС перабудавала ўнутрыпарт. работу: расшырыла ўнутрыпарт. дэмакратыю, прыняла важныя рашэнні па ідэалаг. пытаннях.

Дзевятнаццаты з'езд КПСС (5—14.10.1952) падвёў вынікі дзейнасці партыі за 13 гадоў, якія мінулі пасля XVIII з'езду, зацвердзіў Дырэктывы 5-га пяцігадовага плана (1951—55), перайменаваў ВКП(б) у Камуністычную партыю Савецкага Саюза (КПСС), унёс змены ў Статут КПСС. Пасля смерці Сталіна (5.3.1953) ЦК КПСС узяў курс на ўмацаванне прынцыпу калектыўнасці, выпраўленне недахопаў у стылі парт. і дзярж. кіраўніцтва. Ліпеньскі Пленум ЦК КПСС (1953), які выкрыў злачынствы Берыя, зрабіў сур'ёзныя паліт. вывады. Былі зроблены захады для строгага захавання сацыяліст. законнасці, умацаваны органы суда і пракуратуры, над іх работай устаноўлены парт. кантроль. Вераснёўскі Пленум ЦК КПСС (1953) намеціў меры па ўздыме с. гасп., выбраў Першым сакратаром ЦК М. С. Хрушчова. Важнае нар.-гасп. значэнне мелі асваенне цалінных зямель, паскарэнне навук.-тэхн. прагрэсу ў прамысловасці. *Дваццаты з'езд КПСС* (14—25.2.1956) зрабіў важныя тэарэт. вывады па пытаннях міжнар. грамадскага развіцця, зацвердзіў Дырэктывы па 6-м пяцігадовым плане, унёс змены ў Статут, даручыў ЦК падрыхтаваць праект новай, трэцяй Праграмы КПСС і ўхваліў даклад «Аб культе асобы і яго выніках». 30.6.1956 ЦК КПСС апублікаваў пастанову «Аб пераадоленні культу асобы і яго вынікаў», у якой раскрыў прычыны і сутнасць культу асобы Сталіна, намеціў шляхі пераадолення яго адмоўных вынікаў.

Супраць лініі, распрацаванай XX з'ездам КПСС, выступіла антыпарт. фракцыйная група, якая ўтварылася ў Прэзідыуме ЦК (Маленкоў, Молатаў, Каганавіч). Яе выкрыў і асудзіў чэрвеньскі Пленум ЦК (1957). Ператвараючы ў жыццё рашэнні XX з'езду КПСС, сав. народ пад кіраўніцтвам партыі дасягнуў новых поспехаў у развіцці эканомікі, культуры, навукі, павышэнні дабрабыту працоўных. 4.10.1957, напярэдадні 40-годдзя Кастрычніка, у СССР запушчаны першы ў гісторыі чалавецтва штучны спадарожнік Зямлі. Намнога ўмацавалася магутнасць СССР, магутнасць сусв. сістэмы сацыялізма. Сусв. камуніст. рух стаў самай уплывовай паліт. сілай сучаснасці.

КПСС — натхняльнік і арганізатар будаўніцтва камуністычнага грамадства (1959—71). *Дваццаць першы з'езд КПСС* (нечарговы)



Першая старонка аднаго з ранніх выданняў «Праграмы Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі», прынятай II з'ездам РСДРП (1903). Вокладка першага выдання «Праграмы Расійскай камуністычнай партыі (бальшавікоў)», прынятай VIII з'ездам РКП(б) (1919). Тытульная старонка выдання «Праграмы Камуністычнай партыі Савецкага Саюза», прынятай XXII з'ездам КПСС (1961).

(27.1—5.2.1959) падвёў вынікі гістар. дзейнасці партыі і сав. народа за ўвесь перыяд пасля перамогі Кастрычніка і зрабіў вывад, што сацыялізм у СССР перамог поўнасцю і канчаткова, абвясціў пра ўступленне Сав. краіны ў новы перыяд развіцця — перыяд разгорнутага буд-ва камуніст. грамадства. З'езд зацвердзіў сямігадовы план развіцця нар. гасп. СССР (1959—65), падкрэсліў узрастанне кіруючай ролі партыі ў камуніст. буд-ве. У ходзе барацьбы за ажыццяўленне сямігодкі шырокае развіццё набыў рух калектываў і ўдарнікаў камуніст. працы. 12.4.1961 камуніст Ю. А. Гагарын здзейсніў першы ў гісторыі палёт чалавека ў космас. *Дваццаць другі з'езд КПСС* (17—31.10.1961) падвёў вынікі выканання другой Праграмы партыі, прынятай VIII з'ездам (1919), і прыняў трэцюю *Праграму Камуністычнай партыі Савецкага Саюза*, у якой вызначаны асн. задачы камуніст. буд-ва ў СССР: стварэнне мат.-тэхн. базы камунізма, фарміраванне камуніст. грамадскіх адносін і выхаванне новага чалавека. У прынятых з'ездам Праграме і Статуце зроблены вывад, што КПСС — партыя рабочага класа, у выніку перамогі сацыялізма стала партыяй усяго сав. народа. Пасля з'езду партыя мабілізавала працоўных на выкананне сямігодкі, ажыццяўленне новай Праграмы КПСС. Вялікую ўвагу аддавала яна ўмацаванню згуртаванасці краін сацыялізма, адзінства сусв. камуніст. руху на прынцыпах марксізма-ленінізма, пралет. інтэрнацыяналізму. КПСС зрабіла важны ўклад у падрыхтоўку Дэкларацыі і Заявы, прынятых на міжнар. Нарадах камуніст. і рабочых партый 1957 і 1960, у якіх распрацавана генеральная лінія сучаснага міжнар. камуніст. руху. Велізарнае значэнне для паляпшэння дзейнасці ЦК партыі і Сав. ўрада, пашырэння буд-ва камунізма ў СССР мелі рашэнні кастрычніцкага Пленума ЦК (1964), які даў сур'ёзную крытыку і самакрытыку памылкам і суб'ектывізму ў палітыцы і гасп. кіраўніцтве, пацвердзіў непахіснасць генеральнай лініі партыі, распрацаванай XX, XXI, XXII з'ездамі КПСС, вернасць ленінскім нормам парт. і дзярж. жыцця.

Пленум вызваліў Хрушчова ад абавязкаў Першага сакратара ЦК і Старшыні Савета Міністраў СССР, прызнаў немэтазгодным надалей сумяшчаць гэтыя пасады ў адной асобе, выбраў Першым сакратаром ЦК КПСС Л. І. Брэжнева. Прэзідыум Вярх. Савета СССР 15.10.1964 назначыў Старшынёй Савета Міністраў СССР А. М. Касыгіна. ЦК КПСС распрацаваў і зацвердзіў на пленумах меры па далейшым развіцці с. гасп. (сак. 1965), паляпшэнні кіравання, удасканаленні планавання і ўмацненні эканам. стымулявання прамысл. вытворчасці (вер. 1965), вызначыў эканам. палітыку партыі на сучасным этапе, якая накіравана на паскарэнне тэхн. прагрэсу і павышэнне эфектыўнасці грамадскай вытворчасці.

Дваццаць трэці з'езд КПСС (29.3—7.4.1966) абгрунтаваў і канкрэтызаваў задачы, пастаўленыя Праграмай КПСС з улікам сучасных умоў развіцця сав. грамадства, матэрыяльных і працоўных рэсурсаў, міжнар. становішча. З'езд падвёў вынікі сямігодкі, ухваліў рашэнні сакавіцкага і вераснёўскага Пленумаў ЦК (1965), прыняў Дырэктывы па 8-м пяцігадовым плане, абгрунтаваў неабходнасць узрастання кіруючай ролі партыі ў камуніст. буд-ве, вызначыў задачы ідэалаг. работы партыі, яе знешнепаліт. лінію. Выкананне рашэнняў XXIII з'езду КПСС адбывалася ва ўмовах падрыхтоўкі сав. народа і ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва да знамянальных дат: 50-годдзя Вял. Кастр. сацыяліст. рэвалюцыі і 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. Пад кіраўніцтвам парт. арг-цый па ўсёй краіне шырока разгарнулася сацыяліст. спаборніцтва за дастойную сустрэчу юбілеяў. Для калектываў — пераможцаў спаборніцтва ў гонар 50-годдзя Кастрычніка — устаноўлены Ганаровыя сцягі ЦК КПСС, Прэзідыума Вярх. Савета СССР, Савета Міністраў СССР і ВЦСПС, у гонар

100-годдзя Леніна — юбілейныя Граматы ЦК КПСС і Вярх. Савета СССР, Ленінскі юбілейны медаль. Важнымі тэарэт. дакументамі партыі з'явіліся Тэзісы ЦК КПСС «50 гадоў Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі» (1967) і «Да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна» (1969).

Снежаньскі Пленум ЦК КПСС (1969) патрабаваў павысіць эфектыўнасць грамадскай вытв., паскорыць развіццё навукі і тэхнікі і ўкараняць іх дасягненні ва ўсе галіны нар. гаспадаркі. Кастрычніцкі (1968) і ліпеньскі (1970) Пленумы ЦК КПСС распрацавалі меры для паскоранага ўздыму с. гаспадаркі. Паспяховае развіццё эканомікі дало магчымасць партыі паслядоўна праводзіць курс на павышэнне дабрабыту і культурнага ўзроўню сав. людзей: павышана заработная плата дзесяткам мільёнаў рабочых і служачых, палепшана сац. забеспячэнне многіх катэгорый працоўных, расшырана вытв. прадметаў спажывання, ажыццёўлена вялікая праграма жыллёвага буд-ва, развіцця адукацыі, культуры. Партыя паслядоўна праводзіла міралюбную знешнюю палітыку, выкрывала імперыял. агрэсараў, аказвала дапамогу нац.-вызв. барацьбе народаў, змагалася за згуртаванне краін сацыяліст. садружнасці, за ўмацаванне адзінства сусв. камуніст. руху.

КПСС разам з інш. марксісцка-ленінскімі партыямі зрабіла важны ўклад у падрыхтоўку міжнар. Нарады камуніст. і рабочых партый (1969), якая садзейнічала далейшаму ўмацаванню іх адзінства на прынцыпах марксізма-ленінізма, пралет. інтэрнацыяналізму.

Вынікі велізарнай стваральнай дзейнасці партыі і народа падвёў *Дваццаць чацвёрты з'езд КПСС* (30.3—9.4.1971). З'езд аднадушна ўхваліў паліт. лінію і практ. дзейнасць ЦК, прапановы і вывады, змешчаныя ў справаздачным дакладзе, распрацаваў найважнейшыя праблемы эканам. і сац.-паліт. развіцця сав. грамадства, вызначыў канкрэтную праграму барацьбы за далейшае ўмацаванне згуртаванасці і магутнасці краін сацыялізма, адзінства камуніст. і рабочых партый, усіх антыімперыял. сіл. З'езд зацвердзіў Дырэктывы па пяцігадовым плане развіцця нар. гасп. СССР на 1971—75, прыняў пастанову пра частковыя змены ў Статуце КПСС, выступіў са Зваротам «Свабоду і мір народам Індакітая!» і Заявай «За справядлівы і трывалы мір на Блізкім Усходзе!». XXIV з'езд КПСС адзначыў, што за справаздачны перыяд міжнар. пазіцыі СССР сталі яшчэ больш надзейныя, вырасла роля сусв. сістэмы сацыялізма, працягваў мацнець і паглыбляцца саюз трох асн. рэвалюц. сіл сучаснасці — сацыялізма, міжнар. рабочага руху і нац.-вызв. барацьбы народаў. Пацвердзіў правільнасць сав. знешняй палітыкі, мэта якой — забяспечыць разам з інш. сацыяліст. краінамі спрыяльныя міжнар. ўмовы для пабудовы сацыялізма і камунізма, мацаваць адзінства, дружбу і брацтва сацыяліст. краін, падтрымліваць нац.-вызв. рух і супрацоўнічаць з маладымі краінамі, якія развіваюцца, паслядоўна адстойваць прынцып мірнага суіснавання дзяржаў з розным сацыяльным ладам, даваць рашучы адпор агрэсіўным сілам імперыялізму, аберагчы чалавецтва ад новай вайны. У галіне ўнутранага развіцця дасягнуты вял. поспехі ў камуніст. буд-ве: стварэнні мат.-тэхн. базы камунізма, развіцці сацыяліст. грамадскіх адносін, выхаванні новага чалавека. Паспяхова выкананы 8-ы пяцігадовы план развіцця нар. гасп. СССР, намнога павялічыліся маштабы і палепшыліся якасныя паказчыкі эканомікі. Вытворчасць прамысл. прадукцыі выраслa на 50%, сярэднегадавы аб'ём с.-г. прадукцыі — на 21, нац. даход — на 41%. Выканана вялікая праграма капітальнага буд-ва, палепшылася размяшчэнне прадукц. сіл, паспяхова развівалася эканоміка ўсіх саюзных рэспублік. Далейшае развіццё нар. гасп. і ўмацаванне абараназдольнасці краіны спалучаліся з ростам дабрабыту працоўных. Вялікія дасягненні ў галінах адукацыі, навукі, культуры, аховы здароўя. Паспяхова развіваліся сацыяліст. грамадскія адносіны, сав. дэмакратыя, яшчэ больш вырасла вядучая роля рабочага класа, умацавалася маральна-паліт. адзінства рабочых, калгаснікаў і інтэлігенцыі, дружба народаў СССР. Павялічылася кіруючая роля Камуніст. партыі ў жыцці сав. грамадства. Самаадданай працай сав. народа ў СССР упершыню ў гісторыі пабудавана і паспяхова функцыянуе развітае сацыяліст. грамадства.

XXIV з'езд КПСС прыняў 9-ы пяцігадовы план развіцця нар. гасп. СССР на 1971—75, які з'яўляецца важным этапам у далейшым руху сав. грамадства да камунізма, стварэнні яго мат.-тэхн. базы, умацаванні эканам. і абароннага патэнцыялу краіны. Гал. задача пяцігодкі — забяспечыць значны ўздым матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця народа на аснове высокіх тэмпаў развіцця сацыяліст. вытворчасці, павышэння яе эфектыўнасці, навук.-тэхн. прагрэсу і паскарэння росту прадукцыйнасці працы. З'езд заклікаў удасканальваць парт. кіраўніцтва ўсімі ўчасткамі камуніст. буд-ва, павышаць узровень арганізац. і паліт. работы ў масах, паляпшаць падбор, расстаноўку і выхаванне кадраў, спалучаць калектыўнасць кіраўніцтва з персанальнай адказнасцю за даручаную справу, развіваць крытыку і самакрытыку. З'езд выбраў Цэнтральны Камітэт КПСС і Цэнтральную Рэвізійную Камісію КПСС. Пленум ЦК 9.4.1971 выбраў Генеральным сакратаром ЦК КПСС Л. І. Брэжнева, Палітбюро ЦК КПСС у складзе: чл. Палітбюро — Л. І. Брэжнеў, Г. І. Воранаў, В. В. Грышын, А. М. Касыгін, А. П. Кірыленка, Ф. Д. Кулакоў, Д. А. Кунаеў, К. Т. Мазураў, М. В. Падгорны, Дз. С. Палянскі, А. Я. Пельшэ, М. А. Суслаў, А. М. Шалепін, У. В. Шчарбіцкі, П. Я. Шэлест; канд. ў чл. Палітбюро — Ю. У. Андропаў, П. Н. Дземічаў, П. М. Машэраў, В. П. Мжаванадзе, Ш. Р. Рашыдаў, Дз. Ф. Усцінаў; сакратарамі ЦК КПСС — Л. І. Брэжнеў, П. Н. Дземічаў, І. В. Капітонаў, К. Ф. Катушаў, А. П. Кірыленка, Ф. Д. Кулакоў, Б. М. Панамароў, М. С. Саломенцаў, М. А. Суслаў, Дз. Ф. Усцінаў. Старшынёй Камітэта партыйнага кантролю пры ЦК КПСС зацверджаны А. Я. Пельшэ. Старшынёй Цэнтр. Рэвіз. Камісіі КПСС выбраны Г. Ф. Сізоў. Удзел у рабоце з'езду больш чым 100 дэлегацый камуніст. і рабочых, нац.-дэмакр. і левых сацыяліст. партый з 91 краіны свету надаў яму характар і значэнне сусв.

форуму, з'явіўся яркай дэманстрацыяй пралет. інтэрнацыяналізму, высокага міжнар. аўтарытэту КПСС як авангарда ўсіх рэвалюц. сіл. (Іл. гл. таксама на ўкл. I—II.)

Даты і месца з'ездаў і канферэнцый КПСС, колькасны склад партыі на даты з'ездаў

I з'езд РСДРП, 1—3(13—15).3.1898, Мінск.
II з'езд РСДРП, 17(30).7—10(23).8.1903, Брусель — Лондан.
III з'езд РСДРП, 12—27.4(25.4—10.5).1905, Лондан.
I канфер. РСДРП, 12—17 (25—30).12.1905, Тамерфорс.
IV (Аб'яднаўчы) з'езд РСДРП, 10—25.4(23.4—8.5). 1906, Стакгольм.
II канфер. РСДРП («Першая Агульнарасійская»), 3—7(16—20).11.1906, Тамерфорс.
V (Лонданскі) з'езд РСДРП, 30.4—19.5(13.5—1.6). 1907, Лондан, 150 000 чл. партыі.
III канфер. РСДРП («Другая Агульнарасійская»), 21—23.7(3—5.8).1907, Котка (Фінляндыя).
IV канфер. РСДРП («Трэцяя Агульнарасійская»), 5—12(18—25).11.1907, Гельсінгфорс.
V канфер. РСДРП (Агульнарасійская), 21—27.12. 1908 (3—9.1.1909), Парыж.
VI (Пражская) Усерасійская канфер. РСДРП, 5—17(18—30).1.1912, Прага.
VII (Красавіцкая) Усерасійская канфер. РСДРП(б), 24—29.4(7—12.5).1917, Петраград, больш за 100 000 чл. партыі.
VI з'езд РСДРП(б), 26.7—3.8(8—16.8).1917, Петраград, каля 240 000 чл. партыі.
VII з'езд РКП(б), 6—8.3.1918, Петраград, каля 400 000 чл. партыі.
VIII з'езд РКП(б), 18—23.3.1919, Масква, 313 766 чл. партыі.
VIII Усерасійская канфер. РКП(б), 2—4.12.1919, Масква.
IX з'езд РКП(б), 29.3—5.4.1920, Масква, 611 978 чл. партыі.
IX Усерасійская канфер. РКП(б), 22—25.9.1920.
X з'езд РКП(б), 8—16.3.1921, Масква, 732 521 чл. партыі.
X Усерасійская канфер. РКП(б), 26—28.5.1921, Масква.
XI Усерасійская канфер. РКП(б), 19—22.12.1921, Масква.
XI з'езд РКП(б), 27.3—2.4.1922, Масква, 532 000 чл. партыі.
XII Усерасійская канфер. РКП(б), 4—7.8.1922, Масква.
XII з'езд РКП(б), 17—25.4.1923, Масква, 386 000 чл. партыі.
XIII канфер. РКП(б), 16—18.1.1924, Масква.
XIII з'езд РКП(б), 23—31.5.1924, Масква, 735 881 чл. партыі, 127 741 канд.
XIV канфер. РКП(б), 27—29.4.1925, Масква.
XIV з'езд ВКП(б), 18—31.12.1925, Масква, 643 000 чл. партыі, 445 000 канд.
XV канфер. ВКП(б), 26.10—3.11.1926, Масква.
XV з'езд ВКП(б), 2—19.12.1927, Масква, 887 233 чл. партыі, 348 957 канд.
XVI канфер. ВКП(б), 23—29.4.1929, Масква.
XVI з'езд ВКП(б), 26.6—13.7.1930, Масква, 1 260 874 чл. партыі, 711 609 канд.
XVII канфер. ВКП(б), 30.1—4.2.1932, Масква.
XVII з'езд ВКП(б), 26.1—10.2.1934, Масква, 1 872 488 чл. партыі, 935 298 канд.
XVIII з'езд ВКП(б), 10—21.3.1939, Масква, 1 588 852 чл. партыі, 888 814 канд.
XVIII канфер. ВКП(б), 15—20.2.1941, Масква.
XIX з'езд КПСС, 5—14.10.1952, Масква, 6 013 259 чл. партыі, 868 886 канд.
XX з'езд КПСС, 14—25.2.1956, Масква, 6 795 896 чл. партыі, 419 609 канд.
XXI (нечарговы) з'езд КПСС, 27.1—5.2.1959, Масква, 7 622 356 чл. партыі, 616 775 канд.
XXII з'езд КПСС, 17—31.10.1961, Масква, 8 872 516 чл. партыі, 843 489 канд.
XXIII з'езд КПСС, 29.3—8.4.1966, Масква, 11 673 676 чл. партыі, 797 403 канд.
XXIV з'езд КПСС, 30.3—9.4.1971, Масква, 13 810 089 чл. партыі, 645 232 канд.

Літ.: Ленін У. І. Тв., т. 1—42 (Полн. собр. соч., т. 1—55); КПСС у рэзалюцыях і рашэннях з'ездаў, канферэнцый і пленумаў ЦК, ч. 1—2, Мн., 1954; КПСС в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК, т. 1—7, 8 изд., М., 1970—71; XXII съезд Коммунистической партии Советского Союза. Стенографический отчет, ч. 1—3, М., 1962; XXIII съезд Коммунистической партии Советского Союза. Стенографический отчет, т. 1—2, М., 1966; XXIV съезд Коммунистической партии Советского Союза. Стенографический отчет, т. 1—2, М., 1971; Программа Коммунистической партии Советского Союза, М., 1971; Устав Коммунистической партии Советского Союза, М., 1970; Переписка Секретариата ЦК РСДРП(б) с местными партийными организациями. Сб. документов, т. 1—2, М., 1957; Директивы КПСС и Советского правительства по хозяйственным вопросам, 1917—1957 гг. Сб. документов, т. 1—4, М., 1957—58; КПСС о комсомоле и молодежи (1917—1961). [Зб. дакументаў], 3 изд., М., 1962; КПСС о профсоюзах, [т.] 1—2, М., 1957—63; КПСС о Вооруженных Силах Советского Союза. Документы. 1917—1968, М., 1969; Коммунистическая партия в Великой Отечественной войне. Документы и материалы, М., 1970; За сплоченность международного коммунистического движения. Документы и материалы, 2 изд., М., 1964; История Коммунистической партии Советского Союза, т. 1—5, М., 1964—70; История Коммунистической партии Советского Союза, 4 изд., М., 1971; Курс лекций по истории КПСС, ч. 1—2, Мн., 1970—71; гл. таксама л-ру пры арт. пра з'езды і канфер. КПСС, важнейшыя праблемы марксізма-ленінізма, пра саюзныя і аўтаномныя рэсп., найвыдатнейшых дзеячаў КПСС.

У. М. Сікорскі. Мінск.

КАМУНІСТЫ́ЧНАЯ ПА́РТЫЯ ФІНЛЯ́НДЫІ (КПФ), засн. 29.8.1918 на канферэнцыі замежнай арганізацыі фінскіх сацыял-дэмакратаў, якая адбылася ў Маскве. Вял. роля ў стварэнні КПФ належыць О. В. *Куусінену.* КПФ была адным з заснавальнікаў Камінтэрна (1919). Да 1944 працавала ў падполлі.

У пач. 20-х г. КПФ шмат зрабіла для разгортвання ў краіне сеткі масавых рабочых арг-цый. У 1920 з удзелам КПФ заснавана легальная Сацыяліст. рабочая партыя Фінляндыі (забаронена ў 1923), якая абвясціла сваёй мэтай звяржэнне капіталізму. У 20-я г. КПФ і легальныя рабочыя арг-цыі, што былі пад яе ўплывам, змагаліся за эканам. інтарэсы і дэмакр. свабоды працоўных, за мір і дружбу з Сав. Саюзам. Пад кіраўніцтвам КПФ у 1924—27 адбыліся буйныя эканам. і паліт. выступленні рабочага класа. Пасля VI з'езду (1935), які заклікаў стварыць у краіне адзіны фронт супраць рэакцыі і фашызму, КПФ узмацніла барацьбу за ўмацаванне і згуртаванне прагрэс. сіл Фінляндыі. У перыяд войнаў фін. рэакцыі супраць СССР (1939—40 і 1941—44) КПФ выступала верным абаронцам сапраўдных нац. інтарэсаў фін. народа, змагалася за ўстанаўленне дружалюбных адносін з СССР.

Пасля выхаду Фінляндыі з 2-й сусв. вайны (вер. 1944) КПФ пачала працаваць легальна, узначаліла барацьбу за дэмакратызацыю краіны. За кароткі час вырасла ў масавую партыю. У кастр. 1944 па ініцыятыве КПФ і левых с.-дэмакратаў заснаваны Дэмакр. саюз народа Фінляндыі (ДСНФ), у рамках якога КПФ стала ўдзельнічаць у парламенце, урадзе і муніцыпалітэтах. У 1944—48 прадстаўнікі ДСНФ уваходзілі ва ўрад, актыўна садзейнічалі ажыццяўленню дэмакр. пераўтварэнняў у краіне, фарміраванню пасляваен. знешнепаліт. курсу Фінляндыі, які вызначаецца развіццём дружалюбных адносін з СССР. XI з'езд (1957) прыняў праграму партыі. Праграма зазначае, што сацыяліст. пераўтварэнні ў краіне павінны быць ажыццёўлены ў выніку пераходу дзярж. улады ў рукі рабочага класа і працоўных, якія выступаюць у саюзе з ім. КПФ

лічыць магчымым мірны пераход да сацыялізма, калі рэакц. сілы не ўжывуць насілля. На наступных з'ездах КПФ канкрэтызавала свае задачы ў адпаведнасці з новымі ўмовамі. У 1966—71 камуністы ўваходзілі ва ўрад, што дало магчымасць ажыццявіць шэраг станоўчых мерапрыемстваў: расшырыць дзярж. сектар у эканоміцы, павялічыць асігнаванні на жыллёвае буд-ва, прыняць закон аб прац. пагадненнях, актывізаваць знешнюю палітыку краіны на карысць міру. КПФ удзельнічала ў міжнар. Нарадах камуніст. і рабочых партый у Маскве ў 1957, 1960 і 1969, падпісала прынятыя на іх дакументы. Больш за 50 тыс. чл. (1970). Старшыня КПФ А. Саарынен, ген. сакратар КПФ А. Аалта. Друкаваныя органы — штодзённая газ. «Kansan Uutiset» («Народныя навіны»; адначасова орган ДСНФ) і штомесячны час. «Kommunisti» («Камуніст»).

Літ.: Из истории Коммунистической партии Финляндии, пер. с фин., М., 1960.

М. Р. Круцько. Мінск.

КАМУНІСТЫ́ЧНАЯ ПА́РТЫЯ ФРА́НЦЫІ, гл. *Французская камуністычная партыя.*

КАМУНІСТЫ́ЧНАЯ ПА́РТЫЯ ЧЫ́ЛІ (КПЧ), засн. 2.1.1922 у выніку рэарганізацыі Сацыяліст. рабочай партыі, якая на сваім IV з'ездзе заявіла пра далучэнне да Камінтэрна і прыняла назву Камуністычнай партыі. Адзін з заснавальнікаў КПЧ — відны дзеяч рабочага руху Лац. Амерыкі Л. Э. Рэкабарэн.

З першых дзён існавання КПЧ выступіла за адзінства ўсіх прагрэс. сіл краіны. У 1927—31 дзейнічала ў падполлі. КПЧ належала вял. роля ў стварэнні Нар. фронту (1936—41) з удзелам камуністаў, сацыялістаў і радыкалаў. На прэзідэнцкіх выбарах 1938 перамог кандыдат Нар. фронту радыкал Педра Агірэ, урад якога ажыццявіў некаторыя прагрэс. мерапрыемствы. У 2-ю сусв. вайну КПЧ мабілізоўвала масы на барацьбу з фашызмам, на падтрымку СССР, антыгітлераўскай кааліцыі. Да 1947 партыя налічвала 50 тыс. чл. На прэзідэнцкіх выбарах 1946 перамог прадстаўнік Радыкальнай партыі Г. Гансалес Відэла, якога падтрымала КПЧ на аснове ўзгодненай праграмы. Тры прадстаўнікі КПЧ увайшлі ва ўрад. Аднак Гансалес Відэла здрадзіў дэмакратыі і пад націскам рэакц. сіл пачаў ганенні на кампартыю. У 1948 КПЧ забаронена, да 1958 дзейнічала ў падполлі. Па яе ініцыятыве ў 1953 створаны Адзіны прафс. цэнтр працоўных Чылі, у 1956 Фронт нар. дзеяння (ФНД), у які ўвайшлі прадстаўнікі КПЧ, Сацыяліст. і інш. партый.

Пасля аднаўлення легальнай дзейнасці КПЧ узмацніла барацьбу за карэнныя сац.-эканам. пераўтварэнні, за незалежную знешнюю палітыку Чылі. XII з'езд КПЧ (сак. 1962) прыняў новую праграму партыі і паставіў задачу барацьбы за стварэнне народнага дэмакр. антыімперыял. і антыалігархічнага ўрада. XIII (1965) і XIV (1969) з'езды КПЧ выпрацавалі паліт. лінію, накіраваную на аб'яднанне вакол рабочага класа ўсіх антыімперыял. і антыалігархічных сіл для стварэння нар. ўрада. XIV з'езд прыняў праграму ў новай рэдакцыі, зрабіў змены ў статуце партыі. Паслядоўная, настойлівая барацьба КПЧ за згуртаванне рабочага класа, усіх прагрэс. сіл Чылі закончылася вял. поспехам у снеж. 1969, калі КПЧ разам з Сацыялістычнай, Радыкальнай і інш. левымі партыямі і групамі падпісала пакт Народнага адзінства. Кандыдат Нар. адзінства Сальвадор Альендэ перамог на прэзідэнцкіх выбарах 4.9.1970 і сфарміраваў урад Нар. адзінства, у які ўвайшлі 3 камуністы. КПЧ накіроўвае свае намаганні на далейшае ўмацаванне Нар. адзінства, на паслядоўнае выкананне праграмы Нар. адзінства, якая прадугледжвае ліквідаваць панаванне замежнага імперыялізму, мясцовых манаполій, землеўладальніцкай алігархіі і перайсці да буд-ва сацыялізма. КПЧ удзельнічала ў міжнар. Нарадах камуніст. і рабочых партый у Маскве 1957, 1960 і 1969 і падпісала прынятыя на іх дакументы. Будуецца паводле прынцыпаў дэмакр. цэнтралізму. Каля 120 тыс. чл. (1971). Ген. сакратар ЦК КПЧ Л. *Карвалан.* Друкаваныя органы — штодзённая газ. «El Siglo» («Стагоддзе») і штомесячны час. «Los Principios» («Прынцыпы»).

Л. Я. Машазерская. Масква.

КАМУНІСТЫ́ЧНАЯ ПА́РТЫЯ ЧЭХАСЛАВА́КІІ (КПЧ), засн. ў маі 1921 на базе Чэхаславацкай с.-д. партыі (левай) [ЧСДП(л)] ва ўмовах уздыму рэвалюц. руху ў краіне, які ўзмацніўся пад уплывам Вял. Кастр. сацыяліст. рэвалюцыі. З'езд ЧСДП(л) у Празе 14—16.5.1921 прыняў рашэнне перайменаваць партыю ў КПЧ і далучыцца да Камінтэрна. Працэс стварэння кампартыі закончыўся на Аб'яднаўчым з'ездзе 30.10—4.11.1921, на якім да КПЧ далучыліся арг-цыі ням. і польскіх камуністаў, што дзейнічалі ў Чэхаславакіі. Рашучы ўдар па рэштках с.-д. ідэалогіі і па праваапартунісцкіх тэндэнцыях быў нанесены на V з'ездзе (люты 1929), на якім да кіраўніцтва КПЧ прыйшлі марксісты-ленінцы на чале з К. *Готвальдам.*

У час сусв. эканам. крызісу (1929—33) КПЧ кіравала класавымі баямі пралетарыяту, сялянства, масавымі выступленнямі беспрацоўных, нац. меншасцей. У перыяд нарастання фаш. пагрозы з боку гітлераўскай Германіі КПЧ рашуча і паслядоўна адстойвала нац. інтарэсы, свабоду і незалежнасць краіны, выступала за стварэнне адзінага Нар. фронту, за ўстанаўленне і ўмацаванне саюзу з СССР. У гады фаш. акупацыі дзейнасцю КПЧ кіраваў падпольны ЦК. У сувязі з спецыфічнымі ўмовамі, што склаліся ў Славакіі пасля падзелу Чэхаславакіі (сак. 1939), парт. арг-цыі Славакіі арганізацыйна вылучыліся і аформіліся ў Камуніст. партыю Славакіі. Адзінства паліт. лініі партыі забяспечвала кіраўніцтва КПЧ, што знаходзілася ў эміграцыі (у Маскве). Па ініцыятыве КПЧ усе антыфаш. і дэмакр. сілы краіны аб'ядналіся ў Нац. фронт. Камуністы былі рухальнай сілай антыфаш. Руху Супраціўлення, узначалілі славацкае нацыянальнае паўстанне (жн. 1944) і паўстанне чэшскага народа ў маі 1945 (гл. *Народнае паўстанне 1945*). Камуністы ўвайшлі ў першы ўрад Нац. фронту (крас. 1945). На выбарах у Нац. сход (май 1946) КПЧ атрымала найб. колькасць галасоў, пасля чаго ўрад Нац. фронту ўзначаліў старшыня КПЧ К. Готвальд. Пад кіраўніцтвам КПЧ працоўныя нанеслі рашучае паражэнне буржуазіі, якая спрабавала ў лют. 1948 зрабіць контррэвалюц. пераварот (гл. *Лютаўскія падзеі 1948*). Чэхаславакія стала дзяржавай дыктатуры пралетарыяту. У чэрв. 1948 КПЧ аб'ядналася з с.-д. партыяй на прынцыпах марксізма-ленінізма і на арганіз. аснове КПЧ. У вер. 1948 кампартыя Славакіі арганізацыйна аб'ядналася з КПЧ.

Пад кіраўніцтвам КПЧ працоўныя Чэхаславакіі разгарнулі буд-ва сацыялізма. Выкананнем 1-га пяцігадовага плана (1949—53) у краіне заложаны трывалы фундамент сацыяліст. гр-ва. Агульнадзярж. канферэнцыя КПЧ у ліп. 1960 адзначыла, што ў Чэхаславакіі пера-

маглі сацыяліст. вытворчыя адносіны. У наст. гады былі дасягнуты вял. поспехі ў развіцці сацыяліст. эканомікі, культуры, у павышэнні дабрабыту народа. У дзейнасці партыі ў гэты перыяд побач з поспехамі было нямала цяжкасцей, мелі месца недахопы і асобныя памылкі, асабліва ў ідэалагічнай рабоце, не вялася рашучая барацьба з ажыўленнем дробнабурж. ідэалогіі. У 1968 праваапартуніст. элементы, якія выкарысталі аслабленне кіраўніцтва КПЧ і захапілі многія адказныя пасады ў партыі, урадзе, у сродках масавай інфармацыі, пачалі ў блоку з антысацыяліст. сіламі шырокае наступленне супраць марксісцка-ленінскай лініі партыі, супраць сацыяліст. ладу. Ім удалося ў значнай ступені аслабіць кіруючую ролю і дзейздольнасць партыі, разваліць органы дзярж. улады і, абапіраючыся на шырокую дапамогу імперыял. краін, павесці падрыхтоўку контррэвалюц. перавароту. Марксісцка-ленінскія сілы КПЧ, абапіраючыся на інтэрнацыянальную дапамогу пяці саюзных сацыяліст. дзяржаў, выступілі на абарону сацыяліст. заваёў. У крас. 1969 пленум ЦК КПЧ выбраў новае кіраўніцтва партыі на чале з Г. *Гусаком*. У партыі і ў краіне разгарнулася рашучая барацьба з праваапартуністычнымі, рэвізіяністскімі і антысацыяліст. сіламі. КПЧ капсалідавала свае рады на аснове прынцыпаў марксізма-ленінізма, аднавіла і ўмацавала кіруючую ролю ў грамадстве. XIV з'езд КПЧ (май 1971), які закончыў гэты складаны этап у жыцці партыі, стаў з'ездам трыумфу сацыялізма. Ен вызначыў задачы партыі на далейшым развіцці сацыяліст. грамадства. КПЧ удзельнічала ў міжнар. нарадах камуніст. і рабочых партый у Маскве 1957, 1960 і 1969 і падпісала прынятыя на іх дакументы. Будуецца паводле прынцыпаў дэмакр. цэнтралізму. 1200 тыс. чл. (май 1971). Ген. сакратар ЦК КПЧ Г. Гусак. Друкаваныя органы — штодзённая газ. «Rudé právo» («Чырвонае права») і час. «Nová mysl» («Новая думка»).

Літ.: История Коммунистической партии Чехословакии. М., 1962; Уроки кризисного развития в компартии Чехословакии и обществе после XIII съезда КПЧ. Документ, принятый на пленуме ЦК КПЧ в декабре 1970 г., М., 1971; XIV съезд Коммунистической партии Чехословакии. М., 1971.

Д. В. Мельцэр. Мінск.

КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ ЮГАСЛАВІІ, гл. *Саюз камуністаў Югаславіі.*

КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ ЯПОНІІ (КПЯ), засн. 15.7.1922 на нелегальным з'ездзе ў Токіо ва ўмовах уздыму рабочага руху ў краіне, які пачаўся пад уплывам Вял. Кастр. сацыяліст. рэвалюцыі. З'езд прыняў рашэнне пра ўступленне КПЯ ў Камінтэрн. У стварэнні КПЯ актыўна ўдзельнічалі С. *Катаяма*, К. *Такуда* і інш. Да кастр. 1945 працавала нелегальна.

Перад вайною КПЯ змагалася за тое, каб ажыццявіць у Японіі бурж.-дэмакр. рэвалюцыю праз звяржэнне імператарскай улады і ліквідацыю пазаэкан. пазасцавых рэшткаў феад. памешчыцкай сістэмы, выступала супраць агрэсіі яп. імперыялізму ў Кітаі і ў інш. краінах. Пасля паражэння імперыял. Японіі ў 2-й сусв. вайне КПЯ выступала за поўнае ажыццяўленне *Патсдамскай дэкларацыі 1945*, супраць антыпап. палітыкі яп. урада. КПЯ ўмацоўвала свае пазіцыі сярод рабочых і сялян, выступіла ініцыятарам адзінага дэмакр. фронту. На выбарах у ніжнюю палату парламента ў студз. 1949 КПЯ атрымала каля 3 млн. галасоў (35 месцаў). Колькасць чл. КПЯ павялічылася да 200 тыс. Нападаючыя ролю стам уплыву КПЯ, амер. акупац. ўлады і яп. рэакцыя пачалі рэпрэсіі супраць яе. Фактычна КПЯ была пастаўлена на нелегальнае становішча (з 1955). У гэты перыяд унутры партыі ўзніклі супярэчнасці па важных пытаннях стратэгіі і тактыкі. Уплыў КПЯ сярод працоўных паслабеў, колькасць чл. скарацілася. Рашэнні VI нац. канферэнцыі КПЯ (1955) і VII з'езду (1958) садзейнічалі пераадоленню левасектанцкіх памылак. КПЯ пашырыла ўплыў у прафсаюзах і ў інш. масавых арг-цыях. Партыя выпрацавала колькасна. VIII з'езд (1961) прыняў новую праграму партыі, якую развіў X з'езд КПЯ (1966).

Ва ўмовах, калі адраджаецца і ўмацоўваецца яп. мілітарызм, існуе агрэс. япона-амер. ваенны саюз, КПЯ вядзе барацьбу супраць амер. імперыялізму і яп. манаполіст. капіталу, патрабуе ануляваць япона-амер. дагавор бяспекі, вярнуць Японіі Акінаву, акупаваную ЗША. КПЯ змагаецца за абарону дэмакр. свабод, за павышэнне жыццёвага ўзроўню працоўных. XI з'езд КПЯ (ліп. 1970) зацвердзіў курс на стварэнне адзінага фронту дэмакр. сіл і дэмакр. кааліцыйнага ўрада. На выбарах у верхнюю палату парламента (1971) партыя атрымала каля 4,9 млн. галасоў. КПЯ ўдзельнічала ў міжнародных нарадах прадстаўнікоў камуністычных і рабочых партый у Маскве 1957 і 1960, падпісала прынятыя на іх дакументы. Будуецца паводле прынцыпаў дэмакр. цэнтралізму. 300 тыс. чл. (1970). Старшыня ЦК КПЯ С. *Носака*, старшыня Прэзідыума ЦК К. *Міямота*. Друкаваныя органы — штодзённая газ. «Акахата» («Чырвоны сцяг») і штомесячны час. «Дзэн'эй» («Авангард»).

КАМУНІСТЫЧНАЯ ПРАЦА, праца ва ўмовах камуністычнага грамадства, якая грунтуецца на ўсведамленні кожным чалавекам неабходнасці працаваць без узнагароды, у адпаведнасці са сваімі здольнасцямі. У. І. Ленін пісаў, што К. п.— «праца дабравольная, праца без нормы, праца, якая даецца без разліку на аплату, без умовы аб аплаце, праца па прывычцы працаваць на агульную карысць і па свядомых (перайшоўшых у прывычку) адносінах да неабходнасці працы на агульную карысць, праца, як патрэбнасць здаровага арганізма» (Тв., т. 30, с. 480). Камуністычная праца выступае сама як узнагарода, паколькі яе рэчавыя і сацыяльныя вынікі, становячыся багаццем усяго грамадства, астаюцца багаццем і спосабам самасцвярджэння асобы. Ва ўмовах К. п. выяўляюцца ўсе здольнасці чалавека да творчасці, свабодна разгортваюцца яго духоўныя і фіз. сілы, дасягаецца поўнае супадзенне грамадскіх і асабістых інтарэсаў, ажыццяўляецца прынцып «ад кожнага па здольнасцях, кожнаму па патрэбах». Абектыўныя перадумовы К. п.— найвышэйшае развіццё прадукцыйных сіл грамадства, пераадоленне істотнай розніцы паміж горадам і вёскай, паміж разумовай і фіз. працай, ліквідацыя старога падзелу працы, значнае скарачэнне працоўнага дня і павелічэнне вольнага часу, дасягненне высокага ўзроўню свядомасці ўсіх членаў грамадства.

Характэрныя рысы камуніст. адносін да працы ва ўмовах сацыялізма: адносіны да працы і сацыяліст. уласнасці як да найважнейшага грамадскага і маральнага абавязку, свядомае і добраахвотнае павышэнне прадукцыйнасці працы, развіццё працы на грамадскіх асновах, гарманічнае спалучэнне ў працы асабістых, калектыўсцкіх і грамадскіх інтарэсаў, высокая культура працы і вытворчасці і інш. Сацыяліст. праца — першая ступень К. п. Пераход да К. п. звязаны не толькі з арганізацыйна-гасп., навук.-тэхн. і сац.-эканам. мерапрыемствамі, якія вядуць да развіцця прадукцыйных сіл, удасканалення грамадскіх адносін, пераўтварэння самога зместу, характару і формаў працы, усталявання камуніст. адносін да працы, але і з штодзённай ідэйна-выхаваўчай работай партыі і дзяржавы. Станаўленню элементаў К. п. садзейнічаюць *камуністычныя суботнікі, сацыялістычнае спаборніцтва*, спалучэнне матэрыяльных і маральных стымулаў да працы. Развіццё масавага руху за камуніст. адносіны да працы — адна з найпершых задач камуніст. выхавання.

Літ.: Маркс К. Крытыка Гоцкай праграмы. Мн., 1968; Ленін У. І. Даклад аб суботніках на Маскоўскай агульнай гарадской канферэнцыі РКП(б) 20 снежня 1919 г., Тв., т. 30 (Полн. собр. соч., т. 40); Яго ж. Ад разбурэння векавога ўкладу да творчасці новага, Тв., т. 30 (там жа, т. 40); Праграма Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Мн., 1961; Матэрыялы XXIV з'езду КПСС, Мн., 1971; За победу коммунистического труда, Мн., 1962; Маневич Е. Л., В. И. Ленин о труде при социализме и коммунизме, М., 1969; Косолапов Р. И. Коммунистический труд: природа и стимулы, М., 1968; Дропь П. П. и Коршук В. К. По пути великого почина, Мн., 1969; Щербак Ф. Н. Нравственная ценность коммунистического труда, Л., 1969.

К. Л. Патаенка. Мінск.

КАМУНІСТЫЧНЫ ІНСТЫТУТ ЖУРНАЛІСТЫКІ імя С. М. Кірава (КІЖ), навуч. ўстанова, якая рыхтавала кадры для раённых, абласных і рэспубліканскіх газет. Засн. ў Мінску ў вер. 1932 на базе газетнага аддз. *Камуністычнага універсітэта Беларусі* імя У. І. Леніна. Імя Кірава прысвоена ў 1935. Прымаліся асобы са стажам работы не менш як 3 гады і 2 гады кіруючай парт. і грамадскай работы. Тэрмін навучання тры гады. Пры КІЖы працавала аднагадовая вячэрняя школа журналістаў камсамольска-маладзёжных газет, з 1934 — сектар завочнага навучання газетных кадраў. У 1940 рэарганізаваны ў Бел. ін-т журналістыкі з 4-гадовым тэрмінам навучання. Да чэрв. 1941 КІЖ скончыла каля 300 чал. Спыніў дзейнасць у 1941. *Г. Л. Напрэеў.* Мінск.

КАМУНІСТЫЧНЫ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ, Камінтэрн, 3-і Інтэрнацыянал (1919—1943), міжнар. рэвалюц. пралетарская арганізацыя, якая аб'ядноўвала камуніст. партыі розных краін. Гістар. пераемнік 1-га Інтэрнацыянала, наследнік лепшых традыцый 2-га Інтэрнацыянала. Арганізатарам і кіраўніком К. І. ў першы перыяд быў У. І. Ленін. Ен распрацаваў ідэйна-тэарэт. асновы К. І. і яго арганіз. прынцыпы, залажыў асновы стратэгіі і тактыкі сусв. камуніст. руху. Стварэнне К. І. гістарычна абумоўлена і адпавядала патрабаванням і задачам міжнар. рабочага руху. Найважнейшыя перадумовы заснавання К. І.: крах 2-га Інтэрнацыянала з-за апартунізму яго лідэраў; перамога Вял. Кастр. сацыяліст. рэв., якая арабіла магутны ўплыў на рост рабочага і нац.-вызв. руху ва ўсім свеце; далейшае развіццё У. І. Леніным марксісцкай рэвалюц. тэорыі; існаванне ў Расіі пралет. партыі новага тыпу — партыі бальшавікоў, на вопыце і па прыкладзе якой у інш. краінах пачалі ўзнікаць камуніст. партыі, што ўвайшлі ў К. І.

I (устаноўчы) кангрэс Камінтэрна адбыўся 2—6.3.1919 у Маскве (там жа адбыліся ўсе астатнія кангрэсы). Прысутнічала 52 дэлегаты ад 35 партый і груп з 30 краін (ад кампартыі Літвы і Беларусі К. Гедрыс). Кангрэс абмеркаваў даклад У. І. Леніна «Аб буржуазнай дэмакратыі і дыктатуры пралетарыяту» і прыняў тэзісы, напісаныя Леніным. Тэзісы сталі найважнейшым праграмным дакументам міжнар. рабочага руху. Устаноўчы кангрэс К. І. ў Маніфесце да міжнар. пралетарыяту заклікаў на рашучую барацьбу за заваёву ўлады. Стварэнне К. І. стала паваротным пунктам у гісторыі сусв. камунізма.

На II кангрэсе К. І. (19.7—7.8.1920) прысутнічала 217 дэлегатаў ад 67 арг-цый (у т. л. 27 кампартый) 37 краін. Гал. змест і кірунак работы кангрэсу вызначыла кніга У. І. Леніна «Дзіцячая хвароба «левізны» ў камунізме», якая выйшла напярэдадні. У цэнтры ўвагі кангрэсу стаяла пытанне пра выхаванне, загартоўку партый новага тыпу як найважнейшай умовы паспяховай барацьбы за дыктатуру пралетарыяту. Кангрэс заслухаў даклад У. І. Леніна аб міжнар. становішчы і асн. задачах К. І., зацвердзіў «21 умову» прыёму ў К. І. Асноўныя з іх: прызнанне дыктатуры пралетарыяту, поўны разрыў з рэфармістамі і цэнтрыстамі і выгнанне іх з партыі, спалучэнне легальных і нелегальных метадаў барацьбы, дэмакр. цэнтралізм як гал. арганіз. прынцып партыі. Вял. значэнне мела рашэнне кангрэсу па нац.-калан. і аграрным пытаннях. Кангрэс прыняў статут К. І. і выбраў кіруючы орган — Выканаўчы камітэт К. І. (ВККІ).

III кангрэс К. І. [22.6—12.7.1921; 608 дэлегатаў ад 103 арг-цый (у т. л. ад 48 кампартый) 52 краін] праходзіў ва ўмовах, калі буржуазія перайшла ў контрнаступленне, а пралетарыят вёў абарончыя баі. Пасля вострых спрачак кангрэс аднадушна зацвердзіў распрацаваныя пад кіраўніцтвам У. І. Леніна тэзісы пра тактыку К. І. На аснове рашэнняў кангрэсу Прэзідыум ВККІ ў снеж. 1921 прыняў тэзісы пра адзіны рабочы фронт.

IV кангрэс К. І. (5.11—5.12.1922; 408 дэлегатаў ад 66 арг-цый 58 краін) зацвердзіў тэзісы пра тактыку адзінага фронту, распрацаваныя ВККІ, падкрэсліў, што гал. задачаю кампартый астаецца работа ў масах, каб залучыць на свой бок большасць рабочых. Кангрэс заслухаў даклад У. І. Леніна «Пяць гадоў расійскай рэвалюцыі і перспектывы сусветнай рэвалюцыі» (апошняе выступленне Леніна на кангрэсах К. І.), вызначыў задачу барацьбы з рэакцыяй і фашызмам, абвясціў лозунг адзінага антыімперыял. фронту ў калан. і залежных краінах.

V кангрэс (17.6—8.7.1924; 475 дэлегатаў ад 46 кампартый і 4 рабочых партый з 49 краін і 10 міжнар. арг-цый) упайшоў у гісторыю як кангрэс барацьбы за бальшавізацыю кампартый. Кампартыі павінны былі авалодаць праграмнымі і тактычнымі прынцыпамі марксізма-ленінізма, творча дастасоўваць іх да канкрэтных умоў кожнай краіны. Ставілася задача ператварыць кампартыі ў масавыя арганізацыі, цесна звязаныя з працоўнымі. У сувязі з выступленнямі трацкісцка-зіноўеўскай апазіцыі ў ВКП(б) і актывізацыяй трацкістаў у інш. кампартыях кангрэс цалкам падтрымаў пазіцыю ЦК ВКП(б) у гэтым пытанні.

VI кангрэс К. І. [17.7—1.9.1928; 515 дэлегатаў ад 65 арг-цый (у т. л. 50 кампартый) 57 краін] адзначыў, што небяспека імперыял. вайны супраць СССР павялічылася. Кангрэс вызначыў гэты перыяд — барацьба за абарону СССР ад магчымай імперыял. агрэсіі, за падтрымку кіт. рэвалюцыі і нац.-вызв. руху ў калан. і залежных краінах. Ен заклікаў актывізаваць барацьбу супраць апартунізму ў камуніст. руху, прыняў Праграму К. І.

VII кангрэс (25.7—25.8.1935; 510 дэлегатаў ад 57 кампартый і некалькіх міжнар. арг-цый) праходзіў ва ўмовах, калі ўзмацнілася фаш. пагроза ў капіталіст. краінах і пагроза ўзнікнення сусв. вайны. Гал. месца ў рабоце кангрэсу заняло абмеркаванне даклада Г. М. Дзімітрова «Наступленне фашызму і задачы Камуністычнага Інтэрнацыянала ў барацьбе за адзінства рабочага класа супраць фашызму» і даклада М. Эрколі (П. Тальяці)

«Папярэджанне імперыялістычнай вайны і задачы Камуністычнага Інтэрнацыянала». Кангрэс глыбока прааналізаваў міжнар. становішча, якое склалася пасля прыходу фашыстаў да ўлады ў Германіі, вызначыў стратэгічны план і выпрацаваў маневравую тактыку кампартый у барацьбе супраць наступлення фашызму і пагрозы новай сусв. вайны. Гал. сродкам у гэтай барацьбе кангрэс прызнаў стварэнне адзінага рабочага і нар. фронту. Тактыка нар. фронту была найб. паспяхова выкарыстана ў Францыі і Іспаніі ў 1936 (гл. таксама *Адзіны фронт*).

Кампартыі, выхаваныя на прынцыпах пралетарскага інтэрнацыяналізму, сустрэлі 2-ю сусв. вайну ва ўсеўзбраенні. Дзякуючы К. І. міжнар. рабочы рух зрабіў моцны ўплыў на ход і вынікі 2-й сусв. вайны. Кампартыі былі натхняльнікамі і арганізатарамі ўсенароднага Руху Супраціўлення захопнікам, гэтым завяваліі вял. аўтарытэт сярод працоўных. Разам з тым, ва ўмовах вайны, калі кампартыям трэба было аператыўна вырашаць складаныя і неадкладныя задачы, К. І. не мог забяспечыць з адзінага цэнтра канкрэтнага кіраўніцтва дзейнасцю партый розных краін свету. Улічваючы гэта і зыходзячы з таго, што большасць кампартый колькасна выраслі, арганізацыйна ўмацавалася, мае вопытныя, загартаваныя ў сац. бітвах кіруючыя кадры, Прэзідыум ВККІ ў маі 1943 вырашыў распусціць К. І. Рашэнне было адобрана ўсімі кампартыямі. Роспуск К. І. ўзмацніў ініцыятыву і актыўнасць кампартый і адначасова разбіў ушчэнт паклёп бурж. прапаганды, быццам кампартыі розных краін дзейнічаюць не ў інтарэсах сваіх народаў, а па загаду з-за мяжы. Гістар. заслуга К. І. ў тым, што ён адстаяў вучэнне марксізма ад апашлення і скажэння яго апартуністамі справа і «злева», памог стварыць на ўсіх кантынентах сапраўды рэвалюц. партыі, узброіў іх марксісцка-ленінскай тэорыяй, узнавіў і ўмацаваў інтэрнац. сувязь паміж працоўнымі розных краін, парушаную з-за краху 2-га Інтэрнацыянала ў пач. 1-й сусв. вайны, садзейнічаў развіццю сусв. рэвалюц. руху, умацаваў перадумовы для адзінства дзеянняў усіх антыімперыял. сіл. К. І. выхаваў цэлае пакаленне кіруючых кадраў братніх партый у духу пралет. інтэрнацыяналізму, загартаваў іх у барацьбе за чысціню і творчае развіццё марксізма-ленінізма. Найлепшыя прынцыпы і традыцыі, выпрацаваныя К. І. у міжнар. камуніст. руху, захоўваюцца і цяпер. Сувязь і супрацоўніцтва паміж кампартыямі ажыццяўляюцца на міжнар. і рэгіянальных парадах (гл. *Нарады камуністычных і рабочых партый*), праз абмен дэлегацыямі і інш. сродкамі. Друкаваным органам К. І. быў час. «Коммунистический Интернационал», які выдаваўся ў 1919—43 на рус., англ., франц., ням., іісп. і кіт. мовах.

Літ.: Ленін У. І. Тв. [гл. Даведачны т., ч. 1 (Справочный т. к Полн. собр. соч., ч. 1)]; Да 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна. Тэзісы ЦК КПСС, Мн., 1969; В. И. Ленин и Коммунистический Интернационал, М., 1970; Димитров Г. М. Наступление фашизма и задачи Коммунистического Интернационала в борьбе за единство рабочего класса против фашизма, Избр. произв., т. 1, М., 1957; Коммунистический Интернационал в документах. 1919—1932, М., 1933; Международная встреча, посвященная 30-летию VII конгресса Коминтерна, Прага, 1966; Коммунистический Интернационал. Краткий исторический очерк, М., 1969; Фостер У. История трех Интернационалов, пер. с англ., М., 1959; Трофимов К. С. Обзор источников и литературы по истории Коммунистического Интернационала, «Вопросы истории КПСС», 1963, № 9. *Э. М. Позняк.* Мінск.

КАМУНІСТЫЧНЫ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ МОЛАДЗІ (КІМ), міжнародная масавая арганізацыя працоўнай моладзі, якая існавала ў 1919—43 як секцыя Камінтэрна. Ідэя стварэння КІМа належыць У. І. Леніну. У маі 1919 Выканком Камінтэрна заклікаў моладзь свету стварыць Камуністычны Інтэрнацыянал Моладзі. 1-ы ўстаноўчы кангрэс КІМа (20—26.11.1919, Берлін, удзельнічалі дэлегацыі ад 13 краін), на якім прысутнічаў і прадстаўнік камсамольскіх арг-цый Літвы і Беларусі, прыняў рашэнне ўвайсці ў Камінтэрн на правах секцыі, зацвердзіў Статут і Праграму, выбраў кіруючы орган — Выканаўчы камітэт. КІМ ставіў гал. задачу — аб'яднаць шырокія масы моладзі для барацьбы супраць імперыял. вайны, капіталіст. эксплуатацыі, за эканам., паліт. і культ. правы моладзі і выхаванне яе ў духу марксізма-ленінізма. 3.3.1920 Выканком КІМа прыслаў пісьмо камсамольцам Літвы і Беларусі, у якім выказаў захапленне мужнай барацьбой камсамольцаў Літоўска-Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі з польскімі акупантамі.

2-і кангрэс КІМа (1921) абмеркаваў і вырашыў пытанне пра ўзаемаадносіны паміж камуніст. партыямі і камуніст. саюзамі моладзі; 3-і кангрэс (1922) прыняў рашэнне ўмацоўваць сувязі КІМа з шырокімі слаямі рабочай моладзі; 4-ы (1924) паставіў задачу бальшавізаваць КІМ; 5-ы (1928) вызначыў неабходнасць актывізаваць работу КІМа ў прафсаюзах і антымілітарысцкую работу сярод моладзі; 6-ы (1935) заклікаў стварыць шырокі адзіны фронт моладзі для барацьбы супраць фашызму і падрыхтоўкі вайны. У 1935 КІМ меў 56 секцый. З роспускам Камінтэрна і ўмацаваннем самастойнасці камуністычных саюзаў моладзі Выканкам у 1943 прыняў рашэнне распусціць КІМ. Адыграў важную ролю ў гісторыі міжнар. юнацкага руху, спрыяў ідэалагічнаму і арганізацыйнаму згуртаванню моладзі свету. У сучасных умовах камуніст. саюзы моладзі многіх краін свету, у т. л. ВЛКСМ, уваходзяць у *Сусветную федэрацыю дэмакратычнай моладзі*.

Літ.: Ближе всех. Ленин и юные интернационалисты. Сб. документов и материалов, М., 1963; Привалов В. В. Образование Коммунистического Интернационала Молодежи, Л., 1968.

А. Л. Петрашкевіч. Мінск.

КАМУНІСТЫЧНЫ САЮЗ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ, гл. *Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі Беларусі*.

КАМУНІСТЫЧНЫ САЮЗ МОЛАДЗІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (КСМЗБ), нелегальны камуніст. арг-цыя рэвалюцыйнай моладзі Зах. Беларусі. Працаваў на правах тэрытарыяльнай аўтаномнай арг-цыі Камуніст. саюза моладзі Польшчы (КСМП), меў свой ЦК (знаходзіўся ў Вільні), склікаў з'езды, канферэнцыі. Працаваў пад кіраўніцтвам *Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі* (КПЗБ), быў яе памочнікам і рэзервам. КСМЗБ накіроўваў і ўзначальваў барацьбу працоўнай моладзі за свае правы, за сац. і нац. вызваленне працоўных з-пад прыгнёту капіталістаў, памешчыкаў, польск. акупац. улад, за ўз'яднанне Зах. Беларусі з БССР.

Першыя камуніст. гурткі моладзі на тэр. Зах. Беларусі ўзніклі ў 1919—20. Прадстаўнікі камсамольскіх арг-цый Ваўкавыска, Вілейкі, Маладзечна, Навагрудка, Нясвіжа, Пінска, Баранавіч, Пружан, Слоніма прысутнічалі на 1-м з'ездзе КСМБ (24—27.9.1920, Мінск). Пасля захопу Зах. Беларусі бурж. польскай камсамольцы перайшлі ў падполле. Пры садзеянні камуністаў у 1921 аформіліся камсамольскія арг-цыі ў Брэсце, Гродне, на Слонімшчыне, гурткі ў Ашмянах, Бельску, Гайнаўцы, Індуры, Лідзе, Крынках, Ружанах, Пружанах і інш. У Вільні і на Віленшчыне, захопленай у 1920 бурж. Польшчай, да 1922 існавалі арг-цыі камсамола Літвы. Створаны ў жн. 1921 Віленскі к-т КСМ нелегальна выдаваў газ. «Красная молодежь». Увосень 1923 у Вільні было 90 чл. КСМ, у Беластоку 80, Брэсце 45, Пінску 22, Гродне 20, Слоніме 20, Сувалках 12, Крынках 7. На вёсках, дзе не было самастойных арг-цый, камсамольцы працавалі разам з камуністамі.

КСМЗБ утвораны ў студз. 1924 на 1-й канфер. КСМЗБ (Вільня). На канфер. дэлегаты ад арг-цый Вільні, Беластока, Гродна, Брэста, Пінска былі прадстаўнікамі ад 120 камсамольцаў на волі і больш за 200 у турмах. Канфер. вызначыла прынцып узаемаадносін КСМЗБ з КСМП, распрацавала арганіз. афармленне акруговых, гарадскіх і раённых к-таў КСМЗБ, выбрала ЦК (І. Унгер — сакратар, у лютым 1924 у ЦК КСМЗБ кааптавана, а ў чэрв. 1924 выбрана сакратаром В. З. Харужая). На 2-й канфер. КСМЗБ (чэрв. 1925, Вільня) прысутнічала 14 дэлегатаў ад 1200 чл. КСМЗБ на волі і каля 1500 у турмах. Канфер. абмеркавала арганіз. задачы КСМЗБ, работу КСМЗБ у прафсаюзах, паліт.-асветную работу. На 1-м з'ездзе КСМЗБ (сак. 1931, в. Сляпянка пад Мінскам) 22 дэлегаты былі прадстаўнікамі ад 1150 чл. КСМЗБ на волі і каля 2 тыс. у турмах. З'езд абмеркаваў справаздачу ЦК, антымілітарысцкую работу камсамола і барацьбу з падрыхтоўкай інтэрвенцыі супраць СССР, дзейнасць сярод рабочай і вясковай моладзі, кіраўніцтва піянерскім рухам, прыняў Маніфест, выбраў ЦК. На 3-й канфер. КСМЗБ (чэрв. 1932, пад Мінскам) прысутнічала 19 дэлегатаў ад 3400 чл. КСМЗБ на волі і каля 2 тыс. у турмах. Канфер. абмеркавала антываен. работу, барацьбу камсамола за моладзь, што знаходзілася пад уплывам варожых арг-цый, удзел КСМЗБ у барацьбе супраць падрыхтоўкі імперыял. вайны, белага тэрору, у барацьбе за дэмакр. свабоды і правы моладзі. КСМЗБ пад кіраўніцтвам КПЗБ актыўна ўдзельнічаў у класавых бітвах працоўных Зах. Беларусі, у т. л. ў забастоўках рабочых Вільні, Брэста, Гродна (1932); тэкстыльшчыкаў Беластоцкага прамысл. раёна (1933), рабочых лясных промыслаў Белавежскай пушчы, лесарубаў і возчыкаў лесу з 56 навакольных вёсак і з 40 вёсак Ружанскай пушчы (кастр. 1932 — люты 1934). КСМЗБ удзельнічаў ва ўзбр. выступленнях сялян (гл. *Партызанскі рух у Заходняй Беларусі 1921—25, Асташынскае выступленне сялян, Кобрынскае ўзброенае выступленне сялян 1933, Нарачанскіх рыбакоў выступленне 1935*), у рабоце *Чырвонай дапамогі* (МОПРа Зах. Беларусі), у правядзенні паліт. выступленняў працоўных у дні 1 Мая, Вял. Кастр. рэвалюцыі, смерці У. І. Леніна, К. Лібкнехта і Р. Люксембург; узначальваў святкаванне Міжнар. юнацкага дня; Антываеннага дня (1 жніўня), Дзіцячага тыдня; наладжваў паліт. дэманстрацыі, мітынгі, масоўкі, рэвалюц. вечарынкі; выдаваў і распаўсюджваў лістоўкі, вывешваў рэвалюц. транспаранты; вёў рэвалюц. работу сярод салдатаў і навабранцаў. КСМЗБ удзельнічаў у рабоце *Беларускай сялянска-рабочай грамады, «Змагання», Таварыства беларускай школы* і інш. прагрэс. арг-цый; вёў барацьбу за



Выданні ЦК КСМЗБ.





Карсеты, якімі карысталіся камсамольцы для транспартавання камуністычнай літаратуры.

Лістоўкі ЦК КСМЗБ.


МАНИФЕСТ

Первого Съезда Коммунистического Союза Молодежи Западной Белоруссии ко всей трудящейся молодежи Зап. Белоруссии.

Камуністычны Саюз Моладзі Польшчы.

Камуністычны Саюз Моладзі Зах. Беларусі.

ПРАЦОЎНАЯ МОЛАДЗЬ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ!

школы на роднай мове, арганізоўваў забастоўкі школьнікаў і масавыя выступленні моладзі супраць мілітарызацыі і паланізацыі школ. Пад яго кіраўніцтвам культ.-асвет. гурткі, гурткі маст. самадзейнасці прапагандавалі рэвалюц. ідэі сярод працоўных. У 1933 КСМЗБ стварыў у Вільні легальныя студэнцкія арг-цыі «Фронт» і «Функ», аб'яднаныя пазней у «Студэнцкую лявіцу «Фронт», якая выдавала папулярныя ў Польшчы газ. «Naprzełáj» («Напрасткі»), пасля яе закрыцця — двухтыднёвік «Poprostu» («Папросту»), газ. «Karta» («Карта»). У 1935—37 КСМЗБ змагаўся за стварэнне т. зв. фронту маладога пакалення, састаўной часткі антыфаш. нар. фронту. У час грамадз. вайны ў Іспаніі КСМЗБ арганізаваў збор сродкаў рэспубліканцам, вербаваў добраахвотнікаў; многія чл. КСМЗБ пайшлі дапамагаць рэспубліканцам. Улады каралі камсамольцаў гэтак жа жорстка, як і камуністаў. У 1924—25 у Бельску, Петрашах і Ландварове існавалі спец. лагеры катаванняў для камуністаў, камсамольцаў і рэвалюц. моладзі; камсамольцаў знявольвалі на доўгія гады ў турмы, у *Бяроза-Картузскі канцэнтрацыйны лагер*. Над чл. КПЗБ і КСМЗБ часта наладжваліся масавыя суд. працэсы. У лёхах дэфензівы і ў турмах закатаваны Я. Петрачук, С. Мельніцкая, М. Вячорка, Рагачоўскі, Д. Скульчык, Э. Крэмер, Кузьміцкі і інш.

Перыядычныя выданні ЦК КСМЗБ.



Каб умацаваць сувязі і братняе супрацоўніцтва, з 1925 над КСМЗБ шэфстваваў ЛКСМБ: Мінская арг-цыя ЛКСМБ — над Віленскай арг-цыяй КСМЗБ, Бабруйская — над Лідскай, Мазырская — над Пінскай, Калінінская — над Брэсцкай, Віцебская — над Беластоцкай, Слуцкая — над Баранавіцкай, Аршанская — над Гродзенскай. У 1925 ЛКСМБ стварыў спец. фонд дапамогі КСМЗБ і КСМП. КСМЗБ выдаваў газ. і час.: *«Малады камуніст»*, *«Малады змагар»*, «Пад сцягам камсамола», «Маладая гвардыя», «Голас моладзі», «Камсамолец» (на бел., рус., польск., яўр. мовах), «Młody bojownik» («Малады баец», на польск.), «Prawda żołnierska» («Салдацкая праўда», на польск.), «Poborowiec» («Прызыўнік», на польск.), *«Сцяг піянера»*, «Чырвоны піянер», «Голас акцябронка» і інш. Віленскі АК выдаваў газ. *«Пралом»*, Беластоцкі ГК «Białostocki KZM-owiec» («Беластоцкі камсамолец», на польск.). Нелегальна камсамольскія газ. выдаваліся ў Брэсце, Гродне, Навагрудку, Слоніме. Кіруючыя дзеячы КСМЗБ: В. З. *Харужая*, А. А. *Альшэўскі*, М. М. *Дворнікаў* (С. Тамашэвіч), І. Я. *Дабрыян*, С. В. *Прытыцкі*, М. П. *Маслоўскі*, В. П. Ласковіч, І. В. *Малец*, М. С. Майскі, А. І. Андраюк, В. Будкевіч (Б. Лукашэвіч), Ф. Шчапоўскі (А. Маркоўскі), Я. І. Скурко (М. *Танк*), А. І. *Федасюк*, С. Р. *Анісаў*, М. Я. Міхалоўскі, Д. Шлейфман і інш. У 1938 у сувязі з роспускам КПП, КПЗБ і КПЗУ спыніў дзейнасць і КСМЗБ. Аднак і пасля роспуску чл. КСМЗБ не спынялі рэвалюц. дзейнасці. Выхаваная КСМЗБ моладзь актыўна ўдзельнічала ў аднаўленні Сав. улады пры *ўз'яднанні Заходняй Беларусі з БССР*, у буд-ве сацыялізма на тэр. б. Зах. Беларусі.

Літ.: Анісаў С. Р. З гісторыі камсамольскага падполля Заходняй Беларусі, Мн., 1958; яго ж. За волю і шчасце народа, Мн., 1959; яго ж. Крутымі шляхамі. Запіскі былога камсамольскага работніка-падпольшчыка, Мн., 1960; Славная дочь белорусского народа. Письма, статьи В. Хоружей и воспоминания о ней, Мн., 1960; гл. таксама пры арт. *Камуністычная партыя Заходняй Беларусі*.
С. Р. Анісаў. Мінск.

КАМУНІСТЫЧНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Я. М. Свярдлова, першая ў Савецкай рэспубліцы вышэйшая парт. навучальная ўстанова, якая рыхтавала кадры парт. і сав. работнікаў.

У 1918 у Маскве па ініцыятыве У. І. Леніна і з актыўным удзелам Свярдлова арганізаваны кароткатэрміновыя курсы агітатараў і інструктараў пры ВЦВК, пераўтвораныя ў студз. 1919 у Школу сав. работы. На базе гэтай школы створана Цэнтр. школа сав. і парт. работы, якая паводле пастановы Аргбюро ЦК РКП(б) перайменавана ў ліп. 1919 у Рабоча-сялянскі камуніст. ун-т імя Свярдлова. З 1921 устаноўлены тэрмін навучання 2, пазней 3, у 1925—26 4 гады. Першая навуч. праграма ун-та распрацавана Леніным і Свярдловым. У ліп. і жн. 1919 Ленін прачытаў ва ун-це лекцыі «Аб дзяржаве». Пры ун-це працавалі: Вячэрні камуніст. ун-т партактыву, Камсамольскі камуніст. ун-т, Вячэрняя саўпартшкола, Узорная школа палітграматы, Нядзельны камуніст. ун-т, Завочны сектар, Ін-т аспірантаў. У 1932 універсітэт рэарганізаваны ў Вышэйшы камуністычны сельскагаспадарчы універсітэт імя Свярдлова; з 1935 — Вышэйшая школа прапагандыстаў пры ЦК ВКП(б). У 1933 узнагароджаны ордэнам Леніна.

Паводле рашэння XVIII з'езду ВКП(б) у 1939 створана Вышэйшая партыйная школа пры ЦК ВКП(б) (гл. *Вышэйшая партыйная школа пры ЦК КПСС*). *М. С. Сташкевіч*. Мінск.

КАМУНІСТЫЧНЫ УНІВЕРСІТЭТ БЕЛАРУСІ імя У. І. Леніна, вышэйшая парт. навучальная ўстанова, якая рыхтавала кіруючыя кадры парт. і сав. работнікаў. Засн. ў Мінску ў кастр. 1925 на базе Цэнтр. саўпартшколы (1920—25). Меў аддзяленні: партыйнае, савецкае, прапагандысцкае, газетнае, нар. адукацыі (з 1930); сектары: асноўны (з падрыхтоўчым курсам), вячэрні, завочны (з 1927), курсавы. Тэрмін навучання 3 гады. У вер. 1932 рэарганізаваны ў *Вышэйшую камуністычную сельскагаспадарчую школу Беларусі* з аддзяленнямі партыйна-савецкіх работнікаў і кіруючых работнікаў МТС, калгасаў і саўгасаў. На базе газетнага аддз. ун-та ў 1932 створаны *Камуністычны інстытут журналістыкі* (КІЖ), які існаваў да 1941.

КАМУНІСТЫЧНЫЯ СУБОТНІКІ, добраахвотная бясплатная работа працоўных на карысць грамадства, якая характарызуе іх камуніст. адносіны да працы. У. І. Ленін назваў К. с. вялікім пачынам, фактычнымі парасткамі камунізма, падкрэсліваў, што гэта «...свядомы і дабравольны пачын рабочых у развіцці прадукцыйнасці працы, у пераходзе да новай працоўнай дысцыпліны, у творчасці сацыялістычных умоў гаспадаркі і жыцця» (Тв., т. 29, с. 391).

Ініцыятарамі К. с. былі камуністы дэпо Масква-Сартавальная, якія ў адказ на заклік У. І. Леніна палепшыць работу чыгункі ў ноч на 12.4.1919 пасля рабочага дня ва ўмовах голаду і холаду адрамантавалі для фронту 3 паравозы. Першы масавы К. с. адбыўся 10.5.1919 на Маск.-Казанскай чыгунцы. 1.5.1920 праведзены Усерас. суботнік, у якім удзельнічаў Ленін. З гэтага часу К. с. пашырыліся па ўсёй краіне. На Беларусі першы К. с. адбыўся 19.6.1919 у Віцебску, пазней у Гомелі, Магілёве, Калінкавічах, Оршы, Быхаве і інш. Толькі ў Віцебску з чэрв. да снеж. 1919 праведзена 28 К. с. Першы ўсебел. суботнік адбыўся 8.11.1930. Удзельнікі К. с., прысвечанага 100-годдзю з дня нараджэння Леніна, выпрацавалі прадукцыі на 600 млн. руб. 17.4.1971 у К. с., прысвечаным 101-й гадавіне з дня нараджэння Леніна і XXIV з'езду КПСС, удзельнічала 120 млн. чал., выпушчана прамысл. прадукцыі на 553 млн. руб., больш за 125 млн. руб. перададзена ў фонд новай пяцігодкі. У БССР у К. с. 17.4.1971 удзельнічала 4288 тыс. чал., выпушчана прадукцыі на 21,4 млн. руб. У фонд пяцігодкі пералічана 3792,6 тыс. руб. Гл. таксама *Камуністычная праца*.

Літ.: Ленін У. І. Вялікі пачын, Тв., т. 29 (Полн. собр. соч., т. 39); У истоков коммунистического труда, М., 1959. *М. І. Галенчык*. Мінск.

КАМУНІСТЫЧНЫЯ УНІВЕРСІТЭТЫ, вышэйшыя партыйныя навуч. ўстановы ў СССР, якія рыхтавалі кадры парт., савецкіх работнікаў і работнікаў друку. У К. у. прымаліся парт. і сав. работнікі з парт. і вытворчым стажам не менш як 3—4 гады. У 1932 большасць К. у. рэарганізавана ў вышэйшыя камуніст. с.-г. школы для падрыхтоўкі парт. арганізатараў с. гасп. На Беларусі першы камуніст. ун-т створаны ў 1919 у Гомелі; у 1920 — у Віцебску, у 1925 — у Мінску (гл. *Камуністычны універсітэт Беларусі*). У 1932 пачаў працаваць *Камуністычны інстытут журналістыкі*.

У 1918 створаны камуніст. ун-т у Маскве (гл. *Камуністычны універсітэт*). У 1921 пачалі работу Камуніст. ун-т нац. меншасцей Захаду імя Мархлеўскага, Камуніст. ун-т працоўных Усходу, Туркестанскі рабоча-дэхканскі камуніст. ун-т імя Леніна. У 1922 адкрыліся К. у. ў Казані, Омску, Саратаве. Журналістаў, палітасветработнікаў вышэйшай кваліфікацыі, акрамя таго, рыхтавалі *Акадэмія камуністычнага выхавання* імя Крупскай (у Маскве), Дзярж. ін-т журналістыкі імя «Праўды» (Масква), Ленінградскі палітыка-асветны ін-т, камуніст. ін-ты журналістыкі (Маскоўскі, Ленінградскі, Украінскі і інш.), курсы павятовых партработнікаў пры ЦК ВКП(б), Міжнар. ленінскія курсы і інш. Паводле рашэння XVIII з'езду ВКП(б) у 1939 створана Вышэйшая парт. школа пры ЦК ВКП(б). У 1946 адкрыта Акадэмія грамадскіх навук пры ЦК ВКП(б) — вышэйшая парт. навуч. і навук. ўстанова. *М. С. Сташкевіч*. Мінск.

КАМУТАТЫЎНАСЦЬ (позналац. commutativus пераменлівы, перамешчаны), перамяшчальны закон, нязменнасць сумы ці здабытку пры перастаноўцы складаемых ці сумножнікаў.

Напр., К. аперацый складання і множання лікаў азначае, што $a+b=b+a$, $a \cdot b=b \cdot a$ для любых a і b. Да камутатыўных аперацый належыць таксама складанне функцый, вектараў, матрыц. Прыклады некамутатыўных аперацый — вектарнае множанне вектараў, множанне матрыц, кватэрніёнаў і інш.

КАМУТАЦЫЯ электрычных машын, сукупнасць з'яў, якія адбываюцца пры змене кірунку току ў секцыях якарнай абмоткі калектарнай эл. машыны.

У калектарных эл. машынах (гл. *Пастаяннага току машына*) абмотка якара злучаецца з вонкавым ланцугом праз нерухомыя шчоткі, якія кантактуюцца з калектарам якара. Пры вярчэнні якара секцыі яго абмоткі пачаргова замыкаюцца накоратка шчоткамі і пераключаюцца з адной паралельнай веткі ў другую, што вядзе да змены ў іх кірунку току. Пры гэтым у секцыі паводзяцца рэактыўная эрс і эрс вярчэння (у эл. машынах пераменнага току і трансфарматарная эрс). Пры недапушчальна вялікіх значэннях эрс на кантакце ўзнікае іскрэнне, з-за якога хутка зношваюцца шчоткі і псуецца калектар. Якасць К. ацэньваецца па шкале іскрэння. К. залежыць таксама ад матэрыялу шчотак, іх прыціску, вібрацыі і інш. З прычыны К. абмяжоўваецца магутнасць калектарных эл. машын (да 7000 *квт*). Каб палепшыць К., павялічваюць супраціўленне секцый, якія камутуюцца, кампенсуюць рэактыўную эрс з дапамогаю дадатковага магн. поля.

Літ.: Петров Г. Н. Электрические машины, ч. 3, 2 изд., М., 1968; Вольдек А. И. Электрические машины, М.—Л., 1966. *Б. І. Фірага*. Мінск.

КАМФОРА [1, 7, 7-трыметылбіцыкла-(1, 2, 2)-гептанон-2], $C_{10}H_{16}O$, арган. рэчыва з раду *тэрпенаў*. Бясколерныя крышталі з характэрным пахам, вельмі лятучыя, лёгка ўзганяюцца, t пл. 179 °С, t кіп. 209 °С, шчыльн. 990 *кг/м*³. Раствараецца К. ў спірце, эфіры, маслах і інш. арган. растваральніках.

Існуе К. ў трох ізамерных формах: *d*-, *l*- і *dl*-К. Атрымліваюць *d*-К. з драўніны *камфоравага дрэва*, *l*-К. — з эфірнага алею ігліцы піхты сібірскай, *dl*-К. — сінтэтычна з шкіпінару паводле спосабу сав. вуч. В. Я. Цішчанкі (1861—1941). У прамысловасці выкарыстоўваецца пры вырабе цэлулоіду і плёнак на яго аснове, пры вырабе пораху (надае ўстойлівасць) і інш. *d*- і *l*-К. ўжываецца ў медыцыне як лекавы сродак: пад скуру і ўнутр (растворы і парашкі) для стымулявання кровазвароту і дыхання (пры сардэчнай слабасці, хваробах лёгкіх, інфекцыйных хваробах, атручэннях і інш.); мазі К. і камфоравы спірт — процізапаленчы і антысептычны сродак.

Літ.: Пигулевский Г. В. Химия терпенов, Л., 1949; Рудаков Г. А. Химия и технология камфары, М.—Л., 1961; Машковский М. Д. Лекарственные средства, ч. 1, 6 изд., М., 1967.
І. І. Бардышаў. Мінск.

КАМФОРАВАЕ ДРЭВА, камфоравы лаўр (Cinnamomum camphora), вечназялёнае дрэва сям. лаўровых. Расце ў Карэі, Кітаі, Японіі. У СССР вырошчваецца як дэкар. дрэва на чарнаморскім узбярэжжы Каўказа.

Дрэва выш. да 50 *м* і да 3 *м* у дыяметры. Кара цёмна-шэрая. Лісце яйцападобнае, скурастае, бліскучае, пры расціранні мае спецыфічны пах камфоры. Кветкі дробныя, жаўтаватыя, сабраныя ў кальчакі. Плод — чорна-чырвоная касцянка. Расліна мае эфірны камфоравы алей, які раней быў асноўнай сыравінай для атрымання камфоры. К. д. мае каштоўную драўніну, вырабы з яе не пашкоджваюцца насякомымі.



Камфоравае дрэва: галінка з лісцем і кветкамі.

Літ.: Атлас лекарственных растений СССР, М., 1962; Ненарокомов А. В. Лесное хозяйство Китая, М., 1957.

КАМЧА́ТКА, паўвостраў на ПнУ Азіяцкай часткі СССР. Абмываецца Ціхім ак., Берынгавым і Ахоцкім морамі. Пл. 370 тыс. км², даўж. каля 1200 км, найб. шыр. 450 км. Усх. бераг моцна парэзаны, утварае залівы: Карагінскі, Камчацкі, Краноцкі, Авачынскі і інш.; заходні парэзаны слаба. У сярэдняй частцы К. з ПнУ на ПдЗ перасякаюць хрыбты Сярэдзінны (выш. 3621 *м*, вулкан Ічынская Сопка) і Усходні (выш. да 2485 *м*). Паміж імі Цэнтральнакамчацкая ўпадзіна. На З паўвострава — Заходне-Камчацкая нізіна, на У платопадобнае ўзвышша з конусамі вулканаў (найвыш. Ключаўская Сопка, выш. 4750 *м*). Есць гейзеры і мінеральныя крыніцы.

К. складзена пераважна з верхнемезазойскіх і кайназойскіх асадкавых і эфузіўных адкладаў. Агульная пл. абледзянення 866 км². Карысныя выкапні: пемза, слюда, сера, нафта, вугаль, золата. Клімат марскі мусонны на ўзбярэжжы, кантынентальны ўнутры К. Сярэднял т-ра жн. ад 12 да 16 °С, снежня або лютага ад −11 да −25 °С. Ападкаў 500—1200 *мм* за год. Рэкі (Камчатка, Авача і інш.) паўнаводныя. На Пн К. мохавая тундра. У цэнтр. ч. паўвострава і на У — тайга (лістоўніца, елка). На ўзвышшах зараснікі каменнай бярозы, на схілах гор кедравы сланік. У паніжэннях высакатраўе. На З многа балотаў. Прамысл. звяры: собаль, ліс, выдра. Лоўлі ціхаакіянскага селядца, кеты, горбушы. Найб. горад Петрапаўлаўск-Камчацкі. Гаспадарку гл. ў арт. *Камчацкая вобласць*.

Літ.: Пармузин Ю. П. Северо-Восток и Камчатка, М., 1967. *Г. М. Лукошка.* Мінск.


КАМЧАЦКАЯ ВОБЛАСЦЬ
Маштаб 1:13 000 000
0 130 260 км
М А Г А Д А Н С К А Я
К А Р А К С К А Я
Ш А Й Б У Е В С К А Я
Ч У К О Ц К А Я
Б Е Р Ы Н Г А В С К А Я
О Х О Ц К О Е
М О Р Ы
п-ў Камчатка
Петрапаўлаўск-Камчацкі
Усць-Камчацк
Усць-Большарэцк
Усць-Валыпалка
Ключы
Ічынская Сопка
Карагінскі
Тыгільскі
Алюторскі
Анапкінскі
Усць-Ваямпалка
Тылёва
Ука
Аянка
Мільково
Ніжнекамчацкае
Анапка
Алюторка
Тымлат
Тигиль
Ачайваям
Хайлина
Пахача
Ямск
Седанка
Аманіна
Аметкін
Эвенск
Гижыга
Парэнь
Каменское
Слаутное
Мікіна
Ваямпольга
Тумрок
Ітканы
Ітканскі
Ітканскі
Ітканскі

вочная, муз. і спарт. школы, Дом піянераў, дзіцячыя яслі і сад, Дом культуры, кінатэатр, 2 б-кі, бальніца. Помнік на магіле 1046 сав. воінаў і партызан Айч. вайны. Помнік абарончага дойлідства 13 ст.— *Камянецкая вежа.* У вежы філіял *Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея.*

К. засн. ў 2-й пал. 13 ст. дойлідам *Алексам* паводле загаду валынскага кн. Уладзіміра Васількавіча. З 1366 у Вял. кн. Літ. У 2-й пал. 14 ст. на К. нападаў Тэўтонскі ордэн. З 1383 належаў кн. Яншу Мазавецкаму. З 1413 цэнтр павета ў Троцкім, з 1520 у Падляскім, з 1566 у Берасцейскім (пазней Брэст-Літоўскім) ваяводствах. З канца 15 ст. да 1776 меў магдэбургскае права. У 16 ст. буйны гандл. цэнтр. У руска-польскую вайну 1654—67 разбураны, заняпаў. У 1795 уз'яднаны з Расіяй, у Брэсцкім пав. Гродзенскай губ. У 1897 — 4,6 тыс. ж. У бурж. Польшчы (1921—39) мяст. ў Брэсцкім пав. Палескага ваяводства. Дзейнічала падпольная група КПЗБ. З 23.6.1941 да 22.7.1944 акупаваны ням.-фаш. захопнікамі. *М. І. Алексюк.* Брэст.

КАМЯНЕЦКАЯ ВЕЖА (Камянецкі стоўп, Белая вежа), помнік старажытнарускага абарончага дойлідства. Пабудавана





Камянецкая вежа. Агульны выгляд, разрэз і план.

ў г. п. Камянец (Брэсцкая вобл.) дойлідам *Алексам* у 1271—89 паводле загаду валынскага кн. Уладзіміра Васількавіча як фарпост на зах. граніцы Русі. У 1903 рэстаўрыравана паводле чарцяжа арх. В. Суслава.

К. в.— пяцірусное збудаванне выш. 29,4 *м*, з вонкавым дыяметрам 13,6 *м* і з таўшчынёю сцен 2,5 *м*; агульная пл. ярусаў-паверхаў каля 300 *м*². Змуравана з брусчатай цэглы (26,5×13,5×8 см) з падоўжнымі палосамі ў ніжняй частцы. У сценах вежы — вокны-байніцы, абрамленыя знутры 3-лопасцевымі стральчатымі аркамі. На вяршыні вежы балявая плядоўка, акружаная 14 зубцамі з вузкімі пазіральнымі шчылінамі. На выгляд К. в. манументальная і простая. Маст. ўражанне дасягаецца ўдалым размяшчэннем вежы на ўзгорку, маналітнасцю яе аб'ёму і лаканічнасцю арх. дэталяў. З 1960 у К. в.— філіял *Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея.*

Літ.: Всеобщая история архитектуры, т. 3, Л.— М., 1966, с. 592—593. *У. А. Чантурыя.* Мінск.

КАМЯНЕЦКІ АНТЫФАШЫСЦКІ КАМІТЭТ, падпольная патрыятычная арганізацыя, якая ў Айч. вайну з восені 1941 да ліп. 1944 узначальвала дзейнасць антыфашысцкіх ячэек на тэр. Камянецкага р-на Брэсцкай вобл. Дзейнасць К. а. к. накіроўваў *Брэсцкі абласны антыфашысцкі камітэт.* К. а. к. (арганізацыйна аформлены ў маі 1942) аб'ядноўваў 18 ячэек, у якіх налічвалася больш за 100 чал. Сакратары к-та М. А. Несцярук, Ф. К. Гурман, П. Л. Мурашка, чл. к-та К. А. Замулка, А. Я. Шырнюк, В. М. Хоміч, П. Ф. Жук, А. С. Гурынчук, М. Х. Несцярук.

Падпольшчыкі падтрымлівалі сувязь з партыз. атрадам імя Чкалава брыгады імя Панамарэнкі, з падпольшчыкамі Высокаўскага, Ружанскага, Шарашоўскага, Жабінкаўскага раёнаў. Вялі агітацыю сярод насельніцтва, распаўсюджвалі газ. «За Радзіму», «Заря», зводкі Саюзінфармбюро, лістоўкі і інш. антыфашысцкую л-ру. У в. Мельнікі, Грузавічы, Воля падпольшчыкі праводзілі сходы, прысвечаныя гадавінам Кастрычніка і 1 Мая; здабывалі і перадавалі партызанам зброю і боепрыпасы, медыкаменты, харч. прадукты, выплачвалі тое, збіралі і перадавалі партызанам звесткі пра перадыслакацыю варожых фарміраванняў, іх узбраенне, папярэджвалі аб карных аперацыях, збіралі ў фонд абароны краіны грошы і каштоўнасці. Чл. падполля М. А. Ігнацюк, А. Я. Шырнюк, С. П. Белявец, П. М. Шосцік, К. А. Замулка трымалі канспіратыўныя кватэры. Падпольшчыкі П. С. Белявец, С. П. Каралюк, А. С. Рыбачук і інш. разам з партызанамі праводзілі дыверсіі (знішчалі тэлеф. сувязь, палілі масты на дарогах Камянец — Брэст, Высокае — Пружаны). За час дзейнасці антыфашысты спалілі 10 маёнткаў акупантаў. У баражбе з ням.-фаш. захопнікамі загінулі П. Ф. Жук, Г. Ф. Кандрашук, П. С. Мацюкевіч, П. Л. Мурашка, Я. І. Цыбуля, П. І. Цыбуля, Г. М. Хоміч.

А. Б. Рогаў. Мінск.

КАМЯНЕЦКІ РАЁН, у складзе Брэсцкай вобл. Утвораны 15.1.1940. Займае ПнЗ вобласці. Пл. 1,8 тыс. *км*². Насельніцтва 52,2 тыс. чал. (1971). Падзяляецца на 15 сельсаветаў; г. Высокае. Цэнтр — г. п. Камянец.

Раён размешчаны на плоска-хвалістай Прыбугскай раўніне, прыўзнятай на 150—200 *м* над узр. м. Карысныя выкапні: 3 радовішчы торфу з агульнымі запасамі 17,7 млн. *т* (у т. л. радовішча Зляціна — 10,9 млн. *т*), 6 радовішчаў цагельнай сыравіны—3,1 млн. *м*³ (у т. л. радовішча Малыя Зводы — 1 млн. *м*³ і Павукі каля в. Воўчын — 0,7 млн. *м*³), 2 радовішчы пясчана-жвіровага матэрыялу—11,4 млн. *м*³ (у т. л. радовішча Мінкавічы—9,3 млн. *м*³). Сярэдняя т-ра студз. ад —4,5 да —5, ліп. 18—18,5 °С. Вегет. перыяд 207 дзён. Ападкаў 520 *мм* за год. Рэкі: Буг з прытокамі Лясная, Пульва і інш. Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (49,4%), дзярнова-падзолістыя часова залішне ўвільготненыя (19,6%), тарфяна-балотныя (13,6%), дзярновыя забалачальныя (13,6%), дзярнова-падзолістыя забалачальныя (3,8%) і інш. З мінер. глебаў 79% суплеснаных, 14% суглінкавых, 7% пясчаных. Якасная ацэнка глебаў у балах: ворных зямель 43 (цана бала 0,28 *ц/га* збожжа), кармавых угоддзяў 25, усіх с.-г. угоддзяў 38. Пад лесам 26% тэр. Пераважаюць хвойныя. На Пн раёна вялікі лясны масіў Белавежская пушча. Насляюць раён беларусы, ёсць рускія, украінцы, палякі і інш. Сярэдняя шчыльн. 29 чал. на 1 *км*². Гарадскога нас. 17,2%.



Вёска Распа.

Паліўная база раёна — торфапрадпрыемства «Любашкінскае» з паўбрыкетным з-дам. Прадпрыемствы харч. прамысловасці: масласырзавод і з-д для сушкі агародніны (Камянец), хлебазавод і маслазавод (Высокае), хлебапякарня (Камянец), спіртзавод (Вярховічы); філіял Брэсцкага з-да металавырабаў, спец. аддз. Сельгастэхнікі (Камянец), раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі (Высокае), камбінат буд. матэрыялаў (мех. цэх у Высокім, цагельны з-д і кафляны цэх у Малых Зводах, цагельны з-д у Перасеках, дрэваапр. ўчастак у Вярховічах, чарапічны цэх каля в. Расна), камбінат быт. абслугоўвання, цэх шырспажыву запаведніка «Белавежская пушча». У раёне 26 калгасаў, 2 саўгасы (1971).

Калгасы і іх цэнтры: «Бальшавік» *(Навіцкавічы)*, «Беларусь» *(Вайская)*, імя Дзяржынскага *(Доўбізна)*, «Дружба» *(Агароднікі)*, імя Жданава *(Воўчын)*, «Зара» *(Амельянец)*, імя Калініна *(Свіцюнова)*, «Кастрычнік» *(Відамля)*, «Кастрычніцкая рэвалюцыя» *(Малыя Зводы)*, імя Кірава *(Мартынюкі)*, імя Леніна *(Мікалаева)*, імя Леніна *(Пагранічная)*, «Леніпскі шлях» *(Мінкавічы)*, «Новы шлях» *(Падбела)*, «Перамога» *(Турна)*, «Праўда» *(Каленкавічы)*, «50 гадоў Кастрычніка» *(Яцкавічы)*, «Савецкая Беларусь» *(Расна)*, «Савецкі пагранічнік» *(Макарава)*, «Светлы шлях» *(Дварцы)*, «Світанне» *(Рэчыца)*, імя Свярдлова *(Ставы)*, «40 гадоў Кастрычніка» *(Пелішча)*, «Радзіма» *(Ратайчыцы)*, «Расія» *(Каралін)*, «Усход» *(Навасёлкі)*. Саўгасы і іх цэнтры: «Белавежскі» *(Хадасы)*, імя Дзімітрова *(Дзімітравічы)*.

С. гасп. спецыялізуецца на малочна-мясной жывёлагадоўлі; вырошчваюць бульбу, буракі, лён, збожжавыя. Пад с.-г. ўгоддзямі каля 60% тэр. На пач. 1971 асушана 13,1 тыс. *га* забалочаных зямель. Агульная пасяўная пл. (тыс. *га*, 1970) 74,4, у т. л. пад збожжавымі і зернебабовымі 35,7, тэхн. 3,7, бульбаю 11,4, кармавымі 23,5. У 1971 было (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 51,4 (у т. л. кароў 25,0), свіней 47,2, авечак і коз 13,6. Праз раён праходзяць чыгунка Брэст — Высокае — Бельск-Падляскі, аўтамаб. дарогі Брэст — Камянец — Камянюкі, Высокае — Відамля — Пружаны, Камянец — Жабінка.



Малочнатаварная ферма ў калгасе «Новы шлях».

У раёне (канец 1971) 16 сярэдніх, 22 васьмігадовыя, 53 пач., 2 школы рабочай моладзі, завочная школа, 9 дашкольных установ, 12 Дамоў культуры, 38 сельскіх клубаў, 67 б-к, 68 кінаўстановак (у т. л. 57 стацыянарных), 6 бальніц, 2 урачэбныя ўчасткі, 28 фельч.-ак. пунктаў; туберкулёзны санаторый «Вярховічы». У раёне працавала 813 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, у т. л. 55 інжынераў, 49 аграномаў, 38 эканамістаў, 48 заатэхнікаў і вет. урачоў, 458 настаўнікаў, 49 урачоў; 1389 чал. з сярэдняй спец. адукацыяй. Раённая газ. «Ленінец».

М. У. Амельянчук. Брэст.



КАМЯНІЦА, вёска ў Ізабелінскім с/с Ваўкавыскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса імя Свярдлова. За 18 *км* на Пд ад Ваўкавыска, 110 *км* ад Гродна. 254 ж., двароў 92 (1971). Аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў Айч. вайны.

КАМЯНПОЛЛЕ, вёска ў Камянпольскім с/с Міёрскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Праўда». За 5 *км* на З ад Міёраў, 195 *км* ад Віцебска, на аўтамабільнай дарозе Міёры — Браслаў. 196 ж., гасп. 55 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

КАМЯНЮКІ, вёска ў Камянецкім р-не Брэсцкай вобл., на р. Правал Лясная. Цэнтр сельсавета і запаведна-паляўнічай гаспадаркі «Белавежская пушча». За 23 *км* на Пн ад Камянца, 63 *км* ад Брэста, 51 *км* ад чыг. ст. Жабінка, канцавы аўтобусны прыпынак на дарозе, якая злучае вёску з Камянцом. 970 ж., двароў 301 (1971). Лесазавод, камбінат быт. абслугоўвання, метэастанцыя, таксідэрмічная майстэрня. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячыя яслі-сад, аптэка, аддз. сувязі, сталовая, рэстаран, 2 магазіны, гасцініца. Дзіцячая турысцкая база, музей прыроды. Ням.-фаш. захопнікі загубілі 30 жыхароў вёскі. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў Айч. вайны.

КАНА, японская складовая азбука. Існуе дзве графічныя формы — катакана і хірагана. Вынайдзена ў 8 ст. на аснове графічнага скарачэння кітайскіх іерогліфаў. Сістэма яп. пісьма — мяшанае іерагліф.-літарнае пісьмо.

Алфавіт К. да 1946 складаўся з 48 знакаў, якія абазначалі 5 галосных, паўгалосны і склады з зычных — глухіх і санорных — у спалучэнні з галоснымі. Знакаў было 51, потым 3 адпалі, 2 выключаны паводле рэформы 1946. Сучаснае гукавое значэнне некат. літар не супадае з старажытным.

КАНАВА, вёска ў Баханскім с/с Хоцімскага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр калгаса імя Карла Маркса. За 14 *км* на З ад Хоцімска, 181 *км* ад Магілёва, 32 *км* ад чыг. ст. Камунары. 273 ж., двароў 96 (1971). Пач. школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. Каля вёскі (0,4 *км*) помнік 91 земляку, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

КАНАВАКАПАЛЬНІК, самаходная машына, прычапная прылада ці навясное абсталяванне да трактара, прызначаныя капаць каналы. Выкарыстоўваюцца на асушцы балотаў, буд-ве арашальных сістэм, стужачных пāдмуркаў, пракладцы трубаправодаў, кабельных ліній сувязі, стварэнні дрэнажных сістэм і інш.



Паводле тыпу рабочага органа падзяляюцца на К. з пасіўным рабочым органам (плужныя) і з актыўным. Першымі капаюць каналы з папярочным сячэннем да 1 м² і глыб. да 1,2 *м*, другімі — з сячэннем больш за 1 м². Плужныя бываюць адна- і двухадвальныя. Актыўны рабочы орган К. — фрэза з інерцыйнай разгрузкай ці ротар з гравітацыйнай разгрузкай грунту. Самаходныя шматкаўшовыя экскаватары ротарнага, скрабковага ці ланцуговага тыпу на гусенічным ходзе (ЭР-7А, ЭТН-123, ЭТ-121 і інш.) і фрэзерны (Д-262). Яны робяць канаву за адзін праход. Грунт адвозіцца стужачным транспарцёрам ці фрэзай. Асноўныя тыпы К. ствараюцца на Беларусі ў СКБ «Меліярмаш», у Цэнтр. НДІ механізацыі і электрыфікацыі с. гасп. нечарназёмнай зоны СССР, на Мазырскім з-дзе меліярацыйных машын.

Літ.: Машины для строительства и содержания осушительных каналов, М., 1969.

І. І. Лешковіч.

КАНАВАЛАЎ Дзмітрый Пятровіч [10(22).2.1856, с. Іванаўцы Верхнедняпроўскага пав. Екацярынаслаўскай губ.— 6.1.1929], савецкі хімік. Акад. АН СССР (1923, чл.-кар. 1220). Адзін з заснавальнікаў хім. тэорыі растораў. Класічныя даследаванні К. па пругкасці растораў (законы К.) — аснова ў раздзяленні вадкіх сумесей перагонкаю. Увёў паняцце актыўнай паверхні, што спрыяла развіццю тэорыі гетэрагеннага каталізу.

Тв.: Об упругости пара растворов, 3 кн., 1. 1928.

Літ.: Соловьев Ю. И. и Кипнис А. Дмитрий Петрович Коновалов. 1856—1929, М., 19

КАНАВАЛАЎ Міхаіл Сямёнавіч (н. 19 г. Каломна Маскоўскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). На фронце з 1941. Вызначыўся пры фарсіраванні Зах. Дзвіны каля в. Балбечча і з групай на плацдарме адбіў 2 контратакі праціўніка, гэтым садзейнічаў пераправе 2 палкоў 26.6.1944 з аддзяленнем, перарэзаўшы дарогу каля в. Пяцігорск, памог палку фарсіраваць р. Ула.

КАНАВАЛАЎ Павел Міхайлавіч [15(28).12.1906, в. Вочнема Кірылаўскага пав. Ноўгарадскай губ.— 19.6.1969], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Мінскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. З 1928 у Чырв. Арміі. У партыі з ліст. 1941 — нам. камандзіра, нач. штаба атрада; з студз. 1943 да 18.6.1943 камандзір *партызанскай брыгады № 37* імя А. Я. Пархоменкі Мінскай вобл. З снеж. 1943 у дзеючай арміі. Пасля вайны на гасп. рабоце ў Мінску і ў Асіповіцкім р-не. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.

КАНАВАЛАЎ Рыгор Васілевіч [н. 5(18).1.1912, в. Лагуны Гомельскага пав. Магілёўскай губ.], дзярж. дзеяч БССР. З сялян. Чл. КПСС з 1938. Скончыў Камуніст. ін-т журналістыкі імя Кірава ў Мінску (1939), ВПШ пры ЦК КПСС (1956). Працаваў у газ. «Чырвоная Палаччына» (1933—34), Дзярж. выдавецтве БССР (1938—41). У Айч. вайну на Паўд.-Зах., Сталінградскім, 1-м Укр. франтах. З 1946 у апараце ЦК КПБ: інструктар, заг. сектара, нам. заг. аддзела прапаганды і агітацыі. З 1951 нам. старшыні Дзярж. камітэта па радыёвяшчанні і тэлебачанні пры Савеце Міністраў БССР, з 1963 старшыня Дзярж. камітэта Савета Міністраў БССР па друку. Узнаг. 4 ордэнамі, медалямі.

КАНАВАЛАЎ Фёдар Фядулавіч (н. 19 в. Булдыга Спаскага пав. Тамбоўскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Г


КАНАДА
ЛАБРАДОР
ГРЭНЛАНДЫЯ
ПАЎНОЧНАЕ ЛЕДАВІТАЕ МОРА
ЧУКОЦКАЕ МОРА
БЕРЫНГАВА МОРА
ГУДЗОНАЎ ЗАЛІЎ
ВЕЛІКІЯ ВОЗЕРЫ
ВЕРХНЯЕ
ГУРОН
МІЧЫГАН
ЭРЫ
АНТАРЫА
ОНТАРЫА
ЭДМАНТАН
ВІННІПЕГ
ВІННІПЕГАСІС
ВІКТОРЫЯ
ГЕРШЭЛЬ
ЮКОН
ЛАБРАДОР
ЛІНІЯ ДЭТРОЙТ
ЛІНІЯ ВІНДЗОР
ЛІНІЯ ЭЛЬЗМІР
ЛІНІЯ ЭЛЬБЕРТ
ЛІНІЯ ЭЛЬБЕРТ
ЛІНІЯ ЭЛЬБЕРТ

рой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1944. На фронце з 1941. Вызначыўся на тэр. Віцебскай вобл. ў чэрв. 1944. Абясшкоджваў міны і драцяныя загароды ворага. На самаробным плыце адзін з першых фарсіраваў Зах. Дзвіну і пераправіў на ім больш за 300 воінаў. Жыве ў г. Коўдар Мурманскай вобл.

КАНАВАЛАЎ Яўмен Рыгоравіч [н. 6(19).9. 1914, с. Чарнарэчка Горацкага пав. Магілёўскай губ.], бел. сав. вучоны ў галіне апрацоўкі металаў. Акад. АН БССР (1969; чл.-кар. 1967). Д-р тэхн. н. (1962), праф. (1964). Скончыў Ленінградскі механіка-тэхнал. ін-т (1936). З 1955 заг. лабараторыі трываласці Фіз.-тэхн. ін-та АН БССР, з 1970 в. а. акадэміка-сакратара аддзялення фіз.-тэхн. навук АН БССР. Навук. працы па трываласці металаў і сплаваў, новых відах апрацоўкі металаў, металаапрацоўчым інструменце, фіз.-матэм. асновах ратацыйнай апрацоўкі. Выявіў заканамернасці ўплыву ультрагукавога поля на працэсы расцягнення, кручэння і паўзучасці металаў і сплаваў, устанавіў антыфрыкцыйны ультрагукавы эфект, ультрагукавы капілярны эфект.



Тв.: (Разам з І. С. Лабачэўскім) Ротационное дорнирование, Мн., 1959; Обработка плоских поверхностей шариковыми головками, Мн., 1960; Основы новых способов металлообработки, Мн., 1961; Ультразвуковая обработка металлов, Мн., 1966; (разам з І. Н. Германовічам) Новые способы пропитки изделий с помощью ультразвуковых колебаний, Мн., 1967; Чистовая обработка деталей в магнитном поле ферромагнитными порошками, Мн., 1967; Чистовая и упрочняющая ротационная обработка поверхностей, Мн., 1968; Динамическая прочность металлов, Мн., 1969.

КАНАВАЛЕНКА Уладзімір Ануфрыевіч [9(22).4.1917, в. Скрэбні Віцебскага пав.— 22.3.1944], Герой Сав. Саюза (1943). З сялян. Чл. КПСС з 1942. У Чырв. Арміі з 1937. Удзельнік сав.-фінляндскай вайны 1939—40. У Айч. вайну на фронце з студз. 1942. Вызначыўся ў 1943 у баях пры вызваленні Чарнігаўшчыны і Палесся. Стралк. полк пад камандаваннем К. пераадолеў мінныя палі і першы фарсіраваў р. Сейм, авалодаў чыг. ст. Бахмач Чарнігаўскай вобл., фарсіраваў Дзясну, Дняпро, Прыпяць. Загінуў у баі каля Жмерынкі Віннiцкай вобл. Яго імем названа школа ў в. Замасточча Віцебскага р-на.



КАНАДА (Canada), дзяржава ў Паўн. Амерыцы. Займае паўн. частку мацерыка і *Канадскі Арктычны архіпелаг*. Пл. 9976 тыс. км². Нас. 21,6 млн. чал. (1971). Падзяляецца на



10 правінцый і 2 тэрыторыі. Сталіца Атава (650 тыс. чал., з прыгарадамі, 1970). [На ўклейках: фізічная карта, эканамічная карта і ілюстрацыі].

Дзяржаўны лад. К.— федэратыўная дзяржава, уваходзіць у склад Садружнасці нацый на чале з Вялікабрытаніяй. Адзінай канстытуцыі няма. Дзейнічае шэраг заканадаўчых актаў, прынятых англ. парламентам (Акт аб Брытанскай Паўночнай Амерыцы 1867 з наступнымі папраўкамі і дадаткамі, Акт аб парламенце Канады 1875, Вестмінстэрскі статут 1931 і інш.), і актаў, прынятых парламентам Канады (Біль аб правах 1960 і інш.). На чале дзяржавы англ. каралева, прадстаўніком якой у К. з'яўляецца генерал-губернатар. Заканадаўчая ўлада належыць англ. каралеве і парламенту, які складаецца з 2 палат: сената і палаты абшчын. Сенатары назначаюцца генерал-губернатарам, дэпутаты палаты абшчын выбіраюцца на 5 гадоў. Урад узначальвае прэм'ер-міністр. Суд. сістэма: Вярх. суд, правінцыяльныя вярх. суды і мясцовыя суды.

Прырода. Каля ⅔ тэр. К.— раўніны і плато; горы на З мацерыковай часткі краіны і на ПнУ Канадскага Арктычнага архіпелага. Больш за палову мацерыковай часткі К. займае невысокае, узгорыстае, з мноствам азёраў і балотаў плоскагор'е выш. 300—500 м. Найб. выш. яго 1676 м на ПнУ (Лабрадор). На Пд і ПдЗ да плоскагор'я прылягаюць Цэнтральныя раўніны выш. да 300 м, на З — Вялікія раўніны, на ПнЗ — нізіна Макензі. На З уздоўж узбярэжжа Ціхага ак. цягнуцца маладыя складкавыя горы *Кардыльеры*, якія на тэр. К. складаюцца з усх. і зах. сістэм горных хрыбтоў і зоны ўнутраных плато. Найб. выш. Кардыльераў і усёй К.— гара Логан (6050 м). На крайнім ПдУ — узгорыста-нізкагорная вобласць Апалачаў (выш. 500—700 м). Асн. карысныя выкапні: кам. вугаль, нафта, жал. руда, нікель, медзь, цынк, свінец, серабро, золата, плаціна, уран, азбест. Клімат большай часткі К. умераны, кантынентальны, на Пн — субарктычны і арктычны. Сярэдняя т-ра студз. на Пн ад —30 да —35 °С, на Пд —20 °С, на Ньюфаўндлендзе ад —5 да —10, на зах. узбярэжжы 1—4 °С. Сярэдняя т-ра ліп. ад 3—5 на Пн да 20 °С на Пд. Ападкаў 1000—1400 мм на Атлант. узбярэжжы, 2400—2700 мм за год на Ціхаакіянскім; ва ўнутраных раёнах (плато Прэрый) 250—500 мм. Зімою ўстойлівае снежнае покрыва. На Пн пашырана шматгадовая (вечная) мерзлата. Рачная сетка густая, рэкі многаводныя, замярзаюць на 5—9 месяцаў, багатыя на гідраэнергію, на раўнінах суднаходныя. Многа азёраў, пераважна ледавіковага паходжання. Найб. азёрна-рачныя сістэмы: р. Св. Лаўрэнція з *Вялікімі азёрамі* (частка іх належыць ЗША), р. Макензі з азёрамі Атабаска, Вял. Нявольніцкім, Вял. Мядзведжым, р. Нельсан з воз. Вініпег. Значныя рэкі Кардыльераў Юкан і Калумбія (К. належаць верхнія цячэнні), Фрэйзер. Многа вадаспадаў, вылучаецца Нігарскі на р. Нігара, на граніцы з ЗША. Глебы ў зоне тундры тарфяна-глеевыя, месцамі слабападзолістыя, у зоне тайгі (большая частка К.) падзолістыя, часткова балотныя. На плато Прэрый — каштанавыя, чарназёмныя і бурыя стэпавыя з плямамі саланчакоў, у Кардыльерах горна-падзолістыя, месцамі горна-тундравыя. У раслінным покрыве — шыротная пояснасць. Па мацерыка і большую ч. Канадскага Арктычнага архіпелага займае тундра, на Пд ад яе — шырокая палоса хваёвых лясоў. На ПдУ хваёва-шыракалістыя лясы, на ПдЗ унутраных частак К.— лесастэпы і стэпы, значная частка іх разарана. Жывёльны свет: у тундры — паўн. алень карыбу, тундравы воўк, пясец, заяц-бялляк, белая сава, курапаткі, на



КАНАДА, ЭКАНАМІЧНАЯ КАРТА

паўн. узбярэжжы і астравах Канадскага Арктычнага архіпелага белы мядзведзь; у хваёвых лясах — амер. лось, алень вапіці, горны чарнахвосты алень, мядзведзі (шэры, чорны і буры), расамаха, канадская куніца, андатра і інш.; у стэпах — крот, лугавы сабака, суслік, у Кардыльерах — снежная каза і амер. горны баран. У вадаёмах шмат рыбы. Прамысл. рыбы: траска, ласось, селядзец, макрэль. У краіне 18 нац. паркаў (пл. каля 76 тыс. км²), 265 правінцыяльных (пл. больш за 80 тыс. км²) і 230 запаведнікаў.

Насельніцтва. Большасць — патомкі перасяленцаў з Еўропы; англа-канадцаў 43%, франка-канадцаў 30, немцаў 7, італьянцаў 3, украінцаў 2,5%, жывуць таксама беларусы. Карэннае насельніцтва К.— індзейцы і эскімосы. Большасць іх знішчана еўрап. каланізатарамі, астатнія адцяснёны ў аддаленыя раёны; на Пд жывуць у рэзервацыях. Дзярж. мова — англійская і французская. 45,7% веруючых католікі, астатнія англікане, баптысты і інш. Сярэдняя шчыльн. 2,1 чал. на 1 км², найб. густа заселена вузкая палоса ўздоўж граніцы з ЗША. Гар. насельніцтва 75%. Вял. гарады (млн. чал., 1970): Манрэаль 3,2, Таронта 2,8, Ванкувер 0,9, Атава 0,65.

Гістарычны нарыс. Стараж. насельніцтва К.— індзейскія плямёны і на Пн эскімосы, якія жылі першабытнаабшчынным ладам. Першыя франц. пастаянныя паселішчы ў К. адносяцца да пач. 17 ст. У 1663 К. стала франц. дзярж. калоніяй. Барацьба Англіі і Францыі за К. скончылася перамогай Англіі. Пасля *Сямігадовай вайны 1756—63* К. стала часткаю *Брытанскай імперыі*. Каланізацыя суправаджалася знішчэннем карэннага насельніцтва. Пасля вайны за незалежнасць англійскіх калоній у Паўночнай Амерыцы 1775—83 на тэр. К. эмігравала з ЗША каля 40 тыс. каланістаў. Канстытуцыйны акт 1791, які падзяліў К. на дзве правінцыі — Ніжнюю К. (большасць франц. насельніцтва) і Верхнюю (пераважна англ. насельніцтва), фактычна замацаваў двухнацыянальны характар К. У час англа-амер. вайны 1812—14 К. дала адпор спробам ЗША захапіць ле тэрыторыю. Развіццё капіталіст. адносін, якое пачалося ў пач. 19 ст., умацавала пазіцыі канадскай буржуазіі. Паўстанне 1837 у абедзвюх К. з патрабаваннем рэформаў і незалежнасці ад метраполіі пацярпела паражэнне, але англ. ўрад быў вымушаны пайсці на шэраг уступак нац. буржуазіі. Даве правінцыі былі аб'яднаны ў адну калонію (1840), што дало перавагу канадцам англ. паходжання над канадцамі франц. паходжання. Прыток імігрантаў, буд-ва чыгунак у 50—60-я г. спрыялі значнаму развіццю прамысловасці. Боязь нар. выступленняў, пагроза незалежнасці К. з боку ЗША пасля грамадз. вайны 1861—65 прымусілі канад. буржуазію і англ. каланізатараў пайсці на змову і абвясціць К. ў 1867 першым дамініёнам Англіі. Права на самавызначэнне франка-канадцы не атрымалі. Была створана канфедэрацыя ў складзе некалькіх правінцый. Гэта паскорыла развіццё капіталізму. Зямельны закон (1872), які прадугледжваў бясплатнае надзяленне зямлёю ўсіх, хто хацеў ля атрымаць, спрыяў залучэнню ў К. новых эмігрантаў з ЗША і Еўропы, росту фермерства. Каланізацыя Захаду выклікала паўстанні карэннага насельніцтва на чале з Л. Рылем у 1869—70 і 1885 (былі жорстка задушаны). У пач. 20 ст. узніклі першыя манаполіі, пачалася канцэнтрацыя банкаў. Рост пралетарыяту, развіццё рабочага і фермерскага руху ў канцы 19 — пач. 20 ст. прывялі да ўзнікнення Канадскага кангрэсу прафсаюзаў (1883), Сацыялістычнай (1904) і Сацыял-дэмакр. (1911) партый. У 1-й сусв. вайне К. ўдзельнічала на баку Антанты. Вайна ўзбагаціла канадскія манаполіі. Аслабленне сувязей К. з Вялікабрытаніяй пасля 1-й сусв. вайны, значны рост амер. капіталаўкладанняў прывялі да збліжэння з амер. манаполіямі. Рабочы і фермерскі рух асабліва ўзмацніўся пад уплывам Вял. Кастр. сацыяліст. рэвалюцыі. У 1921 створана Камуніст. партыя К. На забастоўкі, дэманстрацыі ў перыяд сусв. эканам. крызісу 1929—33 урад адказаў масавымі рэпрэсіямі (у 1931 забаронена кампартыя, арыштавана каля 10 тыс. чал.). Паводле Вестмінстэрскага статута 1931 К. юрыдычна ўзаконавана з метраполіяй. Урад К. падтрымаў *Мюнхенскае пагадненне 1938*. У вер. 1939 К. ўступіла ў 2-ю сусв. вайну. Эканамічна памагала Вялікабрытаніі. У 1940 зноў забаронена кампартыя К. (у 1943 на яе аснове створана Прагрэс. партыя, у 1959 — кампартыя). 12.6.1942 устаноўлены дыпламат. адносіны з СССР. У 2-ю сусв. вайну прамысл. вытворчасць К. вырасла ў 2,5 раза, узнікла магутная ваен. прамысловасць. Узмацнілася залежнасць К. ад ЗША. У 1940 К. заключыла пагаднение з ЗША аб сумеснай абароне. ЗША атрымалі права размяшчаць свае войскі на яе тэрыторыі. Пасля 2-й сусв. вайны эканам. залежнасць К. ад амер. капіталу ўзрасла. Урад К. падпісаў Паўночнаатлантычны пакт 1949 і шэраг пагадненняў з ЗША, у т. л. пра размяшчэнне на тэр. К. амер. ракетных баз (1958) і ядз. зброі (1963). Працоўныя К. вядуць барацьбу супраць наступлення манаполій на іх інтарэсы. У 1956 два прафсаюзныя цэнтры аб'ядналіся ў Канадскі рабочы кангрэс. Дэмакр. сілы змагаюцца за незалежную і міралюбную знешнюю палітыку К. У 60-я г. пачасціліся дэманстрацыі і мітынгі працоўных, актывізаваўся студэнцкі, маладзёжны, фермерскі рух. Абвастрылася барацьба франка-канадскага насельніцтва за нац. і сацыяльнае раўнапраўе. К.— чл. ААН з 1945.

У К. жыве больш за 100 тыс. беларусаў. Першая шырокая эміграцыя з Беларусі ў К. была ў 1907. Выхадцы з Мінскай, Гродзенскай губ. сяліліся ў прамысл. гарадах Усходу — Таронта, Манрэалі, Уінсары, дзе была патрэбна танная рабочая сіла. Асабліва многа беларусаў выехала ў Канаду з Зах. Беларусі ў 1926—29. Першыя прагрэс. бібліятэкі рускіх эмігрантаў паявіліся ў 1911, а 1913 ператвораны ў рус. прагрэс. клубы. Пасля перамогі Вял. Кастр. рэвалюцыі ў Расію вярнулася частка палітэмігрантаў. У 1930 на 1-м з'ездзе прадстаўнікоў Рус. рабочых клубаў створаны адзіны Цэнтр. Выхад «Канадского гудка» (існ. у 1931—40) — першай у К. рабочай газеты на рус. мове — горача вітаў М. Горкі. З 1941 выдаецца газ. «Вестник». У гады Вял. Айч. вайны ўзніклі Рускія камітэты дапамогі Радзіме, якія арганізавалі збор матэрыяльных сродкаў. З 1942 працуе *Федэрацыя рускіх канадцаў*, самая масавая прагрэс. арг-цыя сярод славянскай эміграцыі ў Канадзе.

Палітычныя партыі. Большасць у парламенце складаюць 2 бурж. партыі: кіруючая Лібэральная партыя (засн. ў 1873), лідэр П. Э. Трудо; Прагрэсіўна-кансерватыўная партыя (засн. ў 1854), лідэр Р. Стэнфілд. У апошнія гады павялічылася прадстаўніцтва ў парламенце Новай дэмакратычнай партыі (сацыял-дэмакр., засн. ў 1961), лідэр Т. К. Дуглас. Камуністычная партыя К. Засн. ў 1921. Старшыня Ц. Бак, генеральны сакратар У. Каштан.

Дэманстрацыя працоўных супраць намераў урада ўвесці антырабочае заканадаўства. Таронта. 1969.





Папяровая фабрыка ў г. Алберні (правінцыя Брытанская Калумбія).

Гаспадарка. К.— індустрыяльна-аграрная краіна з высокім узроўнем развіцця прамысл. і с. гасп., дае 3,2% (7-е месца, 1970) прамысл. прадукцыі капіталіст. краін. Займае 1-е месца па здабычы нікелю, цынку і азбесту (65%) у капіталіст. свеце, вытворчасці газетнай паперы, 2-е месца па здабычы урану, кобальту, малібдэну і кадмію, золата, прыроднага газу, выплаўцы алюмінію; значнае месца па здабычы платыны, серабра, свінцу, медзі, вытв. электраэнергіі. У эканоміцы К. вялікі ўплыў амер. і англ. манаполій. Доля капіталу ЗША ў аўтамаб. прамысл. 97%, у гумавай 90, хім. 54, эл.-маш.-будаўнічай 66%. На ЗША прыпадае 80% агульнай сумы замежных капіталаўкладанняў, на Вялікабрытанію больш як 10%. Эканоміцы К. характэрна высокая ступень канцэнтрацыі вытворчасці і цэнтралізацыі капіталу, асабліва ў аўтамаб. і цэлюлозна-папяровай прамысл., каляровай і чорнай металургіі. Хранічная з'ява ў эканоміцы — беспрацоўе (у сак. 1970 — 6,7% самадзейнага насельніцтва). У 1970 здабыта: кам. вугалю 11,3 млн. *т* (прав. Новая Шатландыя, Брытанская Калумбія, Нью-Брансуік), нафты 61 млн. *т* (прав. Альберта і Саскачэван), прыроднага газу 67,1 млрд. *м*³ (прав. Альберта); выпрацавана электраэнергіі 203,7 млрд. *кет·гадз*. 80% выпрацаванай электраэнергіі даюць ГЭС (пераважна ў прав. Квебек, Антарыо). Ёсць атамныя электрастанцыі. У 1970 здабыта 47,2 млн. *т* жалезнай руды (прав. Квебек, Антарыо, Брыт. Калумбія). Найб. важныя галіны прамысловасці: цэлюлозна-папяровая (1-е месца ў свеце), чорная і каляровая металургія, нафтаперапрацоўчая, мясакансервавая, аўтамаб.; вытв. абсталявання для лесапільных з-даў; авіяц. прамысловасць. У 1970 выпушчана газетнай паперы 8,0 млн. *т*, аўтамабіляў легкавых 937 тыс., грузавых 251 тыс. шт.; выплаўлена (млн. *т*): чыгуну 8,5, сталі 11,4 (цэнтры Гамільтан, Су-Сент-Мары, Сідні), нікелю 277 тыс. *т*, алюмінію (гал. галіна каляр. металургіі, працуе на прывазных баксітах з Ямайкі, Гаяны) 971 тыс. *т* (цэнтры Арвіда, Бе-Камо, Кітымат, Шавініган-Фолс), медзі 493 тыс. *т*, цынку 411 тыс. *т*, свінцу 186 тыс. *т*. Разнастайная харч. прамысл., ¼ частка яе прадукцыі ідзе на экспарт. Асн. галіны лёгкай прамысл.: баваўняная (70% усіх тканін, якія выпускаюцца), шарсцяная, штучнага шоўку, гарбарна-абутковая. Прамысл. цэнтры: Манрэаль, Таронта, Ванкувер, Квебек, Гамільтан, Вініпег, Галіфакс, Атава, Сарнія. Высокатаварная с. гасп. залежыць ад знешняга гандлю. У с. гасп. ўзмацняецца працэс сац.-эканам. дыферэнцыяцыі фермерскага насельніцтва. Ідзе разарэнне і ліквідацыя дробных і сярэдніх фермаў. Колькасць іх скарацілася з 623 тыс. у 1951 да 430 тыс. у 1966. За гэты перыяд працэнт найбольшых фермаў (з пл. 448 *га* і больш) вырас з 2,7 да 6,3. Фермы па спецыялізацыі жывёлагадоўчыя і збожжавыя. Пад ворнымі землямі 68% (пераважна прав. Саскачэван і Альберта), пад лугамі і пашай 32% усіх с.-г. угоддзяў. Гал. роля належыць збожжавым, перш за ўсё яравой пшаніцы. У правінцыях прэрый збіраюць 98% пшаніцы. У 1970 сабрана (млн. *т*): пшаніцы 9,2, ячменю 9,2, аўса 5,8. Жывёлагадоўля дае 60% кошту ўсёй валавой прадукцыі с. гасп. Асабліва развіта малочная гасп. (прав. Квебек і Антарыо). Пагалоўе (млн. галоў, 1969) буйн. рагатай жывёлы 12,5, з іх 8,4 мясной жывёлы; свіней 5,8, авечак 0,9. У лясных раёнах поўначы пашыраны

Нікелеплавільны завод на паўднёвым усходзе правінцыі Антарыо.





Авіяцыйны завод у г. Молтан (на паўднёвым усходзе правінцыі Антарыо).



Статак буйной рагатай жывёлы ў правінцыі Альберта.

пушны промысел. Важнае значэнне маюць лесанарыхтоўкі і рыбная лоўля. Даўж. чыгунак 72,5 тыс. *км*, 2 транскантынентальныя чыгункі. Шашэйных дарог (разам з дарогамі без цвёрдага пакрыцця) 702,2 тыс. *км*. Па ўнутр. водных шляхах (сістэма Вялікіх азёраў) перавозяць збожжа, нафтапрадукты, жал. руду, вугаль. Танаж гандл. флоту 2,5 млн. бр. рэг. *т* (1968). Гал. марскія порты: Манрэаль, Ванкувер, Галіфакс, Сент-Джонс. Па аб'ёме гандлю К. займае 6-е месца ў капіталіст. свеце. У 1969 экспарт склаў (млрд. дол.) 14,8, імпарт 14,2. У экспарце пераважае сыравіна (38,6%) і паўфабрыкаты (45,9%); доля здабыўной прамысл. і металургіі 30% (жал. руда, нікель, азбест, уран, нафта, прыродны газ, алюмінію, медзь, цынк), лясной (драўнінная маса, піламатэрыялы, газетная папера) 24,2, с.-г. прадукцыі 29,2, у т. л. пшаніцы 13,5%, у імпарце — спажывецкія тавары (33,1%). Гал. роля ў знешнім гандлі належыць ЗША (64% у экспарце і 72% у імпарце, 1967); значны аб'ём гандлю з Вялікабрытаніяй, расшыраюцца гандл. сувязі з СССР і інш. сацыялістычнымі краінамі. Грашовая адзінка — канадскі долар.

Узброеныя сілы К. складаюцца з сухапутных войск, ВПС, ВМС. Агульная колькасць (1970) каля 100 тыс. чал., з іх 5,4 тыс. перададзены аб'яднаным узбр. сілам НАТО і знаходзяцца ў ФРГ і на Кіпры. Вярх. галоўнакамандуючы — прэм'ер-міністр; вышэйшае ваен. кіраўніцтва ажыццяўляе Савет абароны, непасрэднае — міністр абароны. Арганізацыйна ўзбр. сілы аб'яднаны ў 6 камандаванняў: мабільнае, проціпаветранай абароны, ваенна-марское, вучэбнае, транспартна-авіяцыйнае, матэрыяльна-тэхнічнае. Ёсць асобная авіяц. дывізія, перададзеная ўзбр. сілам НАТО. Мабільнаму камандаванню падпарадкаваны 4 механізаваныя брыгадныя групы, парашутны полк, 4 эскадрыллі тактычных знішчальнікаў, некалькі эскадрылляў трансп. авіяцыі і верталётаў. Камандаванню ППА падпарадкаваны 3 эскадрыллі знішчальнай авіяцыі і 2 эскадрыллі венітных кіроўных ракет. У складзе мабільнага, ППА і транспартна-авіяц. камандавання ўсяго каля 300 самалётаў. Ваенна-марскому камандаванню падпарадкаваны Атлантычны, Ціхаакіянскі флоты і авіяцыя ВМС (1 процілодачны авіяносец, 4 падводныя лодкі, 4 эскадрыллі процілодачнай абароны і інш.).

Ахова здароўя. Адзінай сістэмы аховы здароўя няма. Мед. дапамога раздроблена паміж дзярж., страхавымі, дабрачыннымі ўстановамі і ўрачамі, якія практыкуюць прыватна. У 1964 было 1293 стацыянарныя бальнічныя ўстановы на 197 318 ложкаў (10,4 на 1 тыс. ж.). У 1966 працавалі 23 533 урачы (1 урач на 880 ж.), 6199 стаматолагаў, 10 585 фармацэўтаў, 114 583 чал. сярэдняга мед. персаналу. Рыхтуюць урачоў (1968) на 13 мед. ф-тах ун-таў. У 1967 на 1 тыс. ж.: нараджальнасць 18, агульная смяротнасць 7,3, натуральны прырост 10,7, дзіцячая смяротнасць 23,1 на 1 тыс. жыванароджаных. Праблемамі аховы здароўя астаюцца сардэчна-сасудзістыя, першова-псіхічныя хваробы, наркаманія, алкагалізм і рост венерычных хвароб.

Асвета і навуковыя ўстановы. У 20—30-я г. 20 ст. ўведзена абавязковае пач. навучанне, аднак яно не ажыццяўляецца, асабліва сярод дзяцей тубэмнага насельніцтва. Пач. школу наведвае ¼ дзяцей індзейцаў і эскімосаў. Праблема школьнай сістэмы Канады — недахоп школ, кваліфікаваных пед. кадраў, нізкая аплата працы настаўнікаў. Дзіцячыя сады з 3—4 гадоў пераважна прыватныя. Існуюць дзве сістэмы навучання — англійская і французская. Англійская: пачатковая 6-класная школа, потым 3-класная малодшая сярэдняя школа і 3-класная старэйшая школа; 8-класная пачатковая і 4-класная сярэдняя школа. Франц. сістэма: 7+4 або 7+5, або 7+8 класаў. Значнае месца ў праграмах школ адводзіцца рэлігіі. У 1967/68 навуч. г. ў пач. і сярэдніх школах навучаліся 3166,4 тыс. вучняў. Сістэма прафес. адукацыі мае тры тыпы ўстаноў — рамесныя, прафес. сярэдняя школы і тэхнікумы. У ВНУ навучанне платнае, даступнае моладзі маёмных класаў. Сярод ВНУ: ун-ты ў Таронта, Атаве, Манрэалі, Квебеку, Ванкуверы. У 1967/68 навуч. г. было каля 260 тыс. ст-



Універсітэт Брытанскай Калумбіі, г. Ванкувер

дэнтаў. Найб значныя б-кі: Публічная б-ка ў Таронта, б-ка Манрэальскага ун-та. Музеі: Нац. музей Канады і Нац. галерэя ў Атаве, Маст. галерэя ў Таронта, Каралеўскі музей правінцыі Антарыо. Навук. ўстановы: Каралеўскае т-ва Канады, Каралеўская канадская акадэмія мастацтваў. Навук.-вывучальныя т-вы: с.-г. і вет. навук, архітэктуры і горадабудавання, мастацтваў, бібліяграфіі, бібліятэчных навук і музеязнаўства, эканомікі, закону і палітыкі, адукацыі, гісторыі, геаграфіі і археалогіі, мовы і л-ры, медыцыны, прыродазнаўчых навук (агульныя, біял. навукі, матэматыка, фіз. навукі), філасофіі і псіхалогіі, рэлігіі, сацыялогіі і антрапалогіі, тэхналогіі. НДІ: атамная энергія Канады, Нацыянальны савет па даследаванні ў галіне адукацыі, Інт радыю, Мед. даследчы савет, Нац. ракавы ін-т, Дзярж. ін-т сац. даследавання, Савет па даследаванні ў галіне гуманіт. навук і інш.

Друк, радыё, тэлебачанне. У К. выходзіць больш за 100 штодзённых газет, агульным тыражом каля 5 млн. экз. Палову з іх кантралююць найбуйнейшыя газетныя трэсты краіны: «Саўзем прэс», «Томсан ньюс пейперс», «Фры прэс публікейшнс». Друк К. налічвае больш за 450 назваў перыядычных выданняў, але толькі каля 15 з іх сур'ёзна ўплываюць на фарміраванне грамадскай думкі краіны. Найб. уплывовыя газеты: «Toronto Daily Star» («Штодзённая зорка Таронта»), «Globe and Mail» («Пошта з усяго свету»), «Telegram» («Тэлеграма»), «Montreal Star» («Манрэальская зорка»), «La Presse» («Прэса»), «Le Devoir» («Абавязак»). Канадскае кааператыўнае інфармацыйнае агенцтва The Canadian Press (CP), ваен. ў 1917 уладальнікамі бурж. газет. Canadian Broadcasting Corporation (CBC) — радыёвяшчальная карпарацыя. Створаны









Канада.

1. Ніягарскі вадаспад зімою.
2. Від на г. Манрэаль і р. Св. Лаўрэнція.
3. Пшанічныя палі і элеватары ў правінцыі Саскачэван каля г. Рэджайна.
4. Шлюзы паміж азёрамі Верхняе і Гурон.
5. Э. Карм'е. Вежа Манрэальскага універсітэта. 1925—42.
6. П. Кейн. Партрэт індзейца Кі-а-кі-ка-са-ку-уэй. Пасля 1850. Каралеўскі музей Антарыо. Таронта.
7. Дж. У. Морыс. Уезд у квебекскую вёску. Зіма. 1909. Збор Т. Дарлінг. Уэстмаўнт Квебек.
8. Ф. Варлі. Заліў Джорджыян-Бей. Каля 1920. Нац. галерэя Канады. Атава.











1



2



3



4

Карыкатура. 1. А. Дам'е. «Гэтага можна вызваліць — ён ужо бясшкодны». Літаграфія. 1834. 2. М. Ц. Гуціеў. «Будзеце помніць, фашысцкія гады, сталёвую хватку савецкіх палкоў». Малюнак. 1944. 3. Л. В. Чурко. «Паспрабуй разбярыся: ці тут новае ў старым, ці старое — у новым!». Малюнак. 1971. 4. І. І. Церабянёў. Рэцірада французскай конніцы, якая з'ела сваіх коней у Расіі. Афорт. 1812—14. 5. Кукрыніксы. «Уолстрыжка». Малюнак. 1949. 6. Дз. М. Красільнікаў. «Вось Рым — Берлін — Токіо». Малюнак. 7. М. В. Гурло. «Сяргей Антонавіч, калі ласка, па падушачцы, па падушачцы...». Малюнак. 1971.



5



6



7

Літаратура К. развіваецца на франц. і англ. мовах. Фальклор карэннага насельніцтва — індзейцаў і эскімосаў — часткова сабраны англа-канад. пісьменнікамі ў 20 ст. Паэтэса Полін Джонсан (1862—1913) абаранялa правы індзейцаў, арабіла літ. апрацоўку іх легендаў. Пра трагічны лёс эскімосаў пісаў Ф. Моўэт у кн. «Людзі аленевага краю» (1952) і «Народ у адчаі» (1959).

Літаратура на французскай мове. З перыяду франц. каланізацыі зберагліся рэліг. творы і дзённікі першапасяленцаў. Прыгнечанае становішча франка-канадцаў пасля каланізацыі К. англічанамі (1763), улада каталіцызму надалі л-ры К. на франц. мове спецыфічна нац. рысы: ідэалізацыя патрыярх. побыту, рэлігійнасць. У сярэдзіне 19 ст. зарадзілася патрыят. школа паэтаў-рамантыкаў на чале з А. Ж. Крэмазі і рамант. проза (Ф. дэ Гаспе-бацька). Элементы рэалізму пачынаюцца ў рамане «Марыя Шапдлен» Л. Эмона. Трагічнае светаадчуванне ўласціва паэту С. Д. Гарно. Пасля 2-й сусв. вайны галоўным кірункам у л-ры К. стаў рэалізм. Раманісты Р. Лемлен, Г. Руа, Рынге ў 40-я г. распрацоўвалі сац. праблематыку, тэму барацьбы супраць нац. прыгнёту. Проза 50-х г., адзначаная паглыбленым псіхалагізмам, адлюстравала ўнутр. адзіноту чалавека ў капіталіст. свеце (І. Тэрыо, Э. Клуцье). Раман Ж. Ж. Рышара «Агонь у азбесце» (1956) пра барацьбу прадпрыемстваў. У 60-я г. рост нац. самасвядомасці паглядаецца ў прозе К. Жасмена, Ю. Акена, М. К. Бле, у паэзіі Р. Жыгера, Ж. Г. Пілона і інш.

Літаратура на англійскай мове. Нац. рысы набыла ў 2-й трэці 20 ст. Да гэтага часу абмяжоўвалася традыцыямі англ. рамантызму і мела перайманьны характар. У паэзіі і прозе 19 ст. панаваў рамантызм. У 20-я г. 20 ст. з ростам нац. самасвядомасці пачаліся літ. часопісы, анталогіі, кнігі па гісторыі англа-канад. л-ры; вылучыліся творчасць пісьменніка-гумарыста С. Лікака, паэзія У. Макдональда — страснага праціўніка вайны і сябра СССР, Э. Дж. Прэта, які апяваў магутнасць прыроды, сілу чалавека і машыну — плён яго працы. Суса. вядомасць набылі творы анімаліст. жанру (Ч. Робертс, Э. Сетан-Томпсан, Шэрал Сава — сапр. прозв. Дж. Белані). Крытычны рэалізм развіваўся з 40-х г. (Ф. Гроў, М. Колехен, Х. Маклінан). Асн. тэма 60-х г.— хаос капіталіст. свету, які прыводзіць адных герояў да паліт. пратэсту, другіх — да духоўнага спусташэння. Верай у моц адзінства працоўных розных нацыянальнасцей прасякнуты раманы Г. Булера. У рамане пісьменніка-камуніста Г. Д. Картэра «Сыны без бацькоў» (1955) паказаны калектыў рабочых, якія выступілі на абарону сваіх правоў. На бел. мову перакл. творы Ч. Робертса («Звярыныя малечы», «Паляўнічы Чырвонай скалы», абедзве 1928) і Э. Сетан-Томпсана («Гісторыя аднаго мядзведзя», 1927; «Лепш смерць, чым няволя», 1928; «Рванае вушка», 1939).

Архітэктура, выяўленчае мастацтва. Да каланізацыі К. развівалася мастацтва абарыгенаў — індзейцаў і эскімосаў (разьба і гравіроўка па рогу, камені і косці, апрацоўка самародных металаў, выраб керамікі і ўзорыстых тканін, роспіс па скуры). Традыц. жыллё індзейцаў — вігвамы (буданы), ціпі (палаткі), на ўзбярэжжы Ціхага ак. драўляныя каркасныя дамы, багата аздобленыя разьбою; эскімосы жывуць у паўзямлянках і іглу (жыллё з снегу). З каланізацыяй у К. пачаліся еўрап. формы архітэктуры — франц. класіцызм, пазней англ. псеўдаготыка (канец 18 — пач. 19 ст.). У канцы 19 — пач. 20 ст. пануе эклектыка. Выпрацоўваецца стандартная структура новых гарадоў з 2-павярховай забудовай, рэгулярнай планіроўкай. Пасля прыходу еўрапейцаў у канцы 18—19 ст. пад уплывам франц. ракако, а потым класіцызму развіваецца прафес. мастацтва: жывапіс (партрэтыст Ф. Бакур, пейзажыст П. Кейн, жанрыст К. Крыгхаф), скульптура (Ф. Эбер). Найб. значныя канадскія мастакі 20 ст.— жывапісцы Дж. У. Морыс, К. Ганьён, члены «Групы сямі» (Ф. Варлі, Э. Холгейт і інш.). У 20—30-я г. 20 ст. ўзнікаюць абстракцыянізм і сюррэалізм, якія пры падтрымцы ўрада і манаполій занялі пануючыя пазіцыі ў канадскім мастацтве. Рэаліст. традыцыі прытрымліваюцца жывапісцы Ф. Тэйлар, Р. Пілo, паслядоўнікі «Групы сямі», звязаныя з рабочым рухам. У сярэдзіне 20 ст. перабудоўваюцца і разрастаюцца гарады, будуюцца ў сучасных формах буйныя прамысл. і грамадскія комплексы. Сярод архітэктараў Э. Карм'е, Ф. Пейдж, Дж. Б. Паркін, Р. Фейрфілд і інш.



Э. Холгейт. Плытагон. 1926. Мастацкая асацыяцыя. Сарнія.

Музыка. Муз. жыццё з пач. еўрап. каланізацыі было звязана з англ. і франц. музыкай. Прафес. музыка доўгі час існавала пераважна ў форме царк. спеваў, ігры на аргане. Муз. жыццё актывізуецца ў 2-й пал. 19 ст.: узнікаюць філарманічныя т-вы, выступаюць еўрап. музыканты, калектывы з ЗША. Зараджаецца і ўласна канадскі муз. фальклор (бытавыя песні, рамантычныя балады, рыбацкія песні). Актыўны муз. дзеяч гэтага часу К. Лаваль. Прадстаўнікі нац. кірунку ў канадскай музыцы (узнік каля 1940) — Х. Вілан, А. Лалібертэ, Э. Макмілан, К. Шампань, В. Пелецье. З сучасных музыкантаў: кампазітары В. Аршэр, П. Мерюор, Ж. Папіно-Куцюр, піяніст Г. Гулд, спявачка Л. Маршал. Муз. цэнтры — Таронта, Манрэаль, Квебек (пастаянныя аркестры, кансерваторыі і інш.).

Тэатр. Першыя тэатр. паказы адбыліся ў пач. 17 ст. У 1789 у Галіфаксе пабудаваны «Новы вялікі т-р», у 1825 у Манрэалі адкрыўся першы пастаянны «Т-р Руаяль». У 18 — 1-й пал. 19 ст. выступалі трупы, пераважна з Францыі, Англіі і ЗША. У 19 ст. ў вял. гарадах паявіліся нац. тэатр. трупы. У канцы 19 — пач. 20 ст. пашырылася сістэма вандроўных т-раў «Роўд» (дарога). Асноўным у 20—30-я г. становіцца аматарскі т-р. У Таронта, Манрэалі, Уінсары дзейнічаюць укр. і бел. аматарскія калектывы. Пасля 2-й сусв. вайны адкрыліся прафес. т-ры і т. зв. цэнтры мастацтваў у Таронта, Галіфаксе, Манрэалі, Вініпезе, Эдмантане і інш. Адбываюцца штогод фестывалі драм. мастацтва (найб. вядомы — шэкспіраўскі, з 1953 у Стратфардзе).

Кіно. Рэгулярная вытворчасць фільмаў у К. пачалася з 1914. Вял. ролю ў развіцці кіно адыграў англ. рэж.-дакументаліст Дж. Грырсан (у 1939—45 працаваў у К.). Пераважаюць дакумент. навукова-папулярныя і вучэбныя фільмы (у год каля 700, мастацкіх да 12). З 1957 у Стратфардзе, Манрэалі, Ванкуверы адбываюцца міжнародныя кінафестывалі.

Літ.: Сущенко В. В. Монополистический капитал Канады, М., 1964; Райерсон С. Б. Основание Канады. Канада с древнейших времен до 1815 года, пер. с англ., М., 1963; Яго Ж. Неравный союз. История Канады. 1815—1873, пер. с англ., М., 1970; Бак Т. Наша борьба за Канаду, пер. с англ., М., 1961; Яго Ж. Влияние Великой Октябрьской революции на канадское рабочее движение, [пер. з англ.], М., 1967; Яго Ж. Влияние В. И. Ленина и ленинизма на развитие Коммунистической партии Канады, пер. с англ., М., 1970; Окулевич Г. Русские в Канаде, Торонто, 1952; Антипова А. В. Канада. Природа и естественные ресурсы, М., 1965; Бородаевский А. Канада: монополистический капитал бывшей переселенческой колонии, «Мировая экономика и международные отношения», 1969, № 11; Ванникова Н. И. Канадская литература на французском языке, М., 1969; Всеобщая история искусств, т. 6, кн. 1, М., 1965.

В. М. Верацейнікава (прырода), *Ф. С. Фешчанка* (гасп.), *Дз. П. Бяляцкі* (ахова здароўя). Мінск; *З. К. Навохіна* (асвета, навук. ўстановы), *А. М. Давыдаў* (друк, радыё, тэлебачанне), *Л. С. Арол* (літаратура). Масква.

КАНАДО́НТЫ (ад грэч. kōnos конус+ódūs зуб), рэшткі выкапнёвых жывёл у выглядзе зубоў ці пласцінак памерам да 2—3 *мм* з зубападобнымі вырастамі.

Шырока вядомыя ў марскіх карбанатных адкладах Еўропы, Азіі, Паўн. Амерыкі, Аўстраліі ад кембрыю да трыясу, месцамі (Афрыка) да верхняга мелу. На Беларусі трапляюцца ў адкладах ардовіку, сілуру, дэвону і карбону. Маюць значэнне ў геалогіі для вызначэння ўзросту парод, расчляянення і карэляцыі разрэзаў.

Літ.: Основы палеонтологии. Бесчелюстные, рыбы. М., 1964.

КАНА́ДСКІ АРКТЫ́ЧНЫ АРХІПЕЛА́Г, у Паўн. Ледавітым ак. паміж Грэнландыяй і паўн. узбярэжжам Паўн. Амерыкі. Пл. 1,3 млн. *км*². Уваходзіць у склад Канады. Найб. а-вы: Бафінава Зямля (512 тыс. *км*²), Вікторыя (212 тыс. *км*²), Элсмір (200,5 тыс. *км*²).

К. А. а. мацерыковага паходжання. Складзены пераважна з крышталічных парод. Есць ледавікі. Рэльеф на ПнУ высакагорны, выш. да 2926 *м* (в-аў Элсмір). На З і ПдУ — узгорыстая раўніна. У высакагорнай вобл. пераважаюць адасобленыя горныя масівы з платопадобнымі вяршынямі. Астравы паўн.-зах. часткі — платопадобныя ўзвышшы; паўд.-заходняя — нізінная раўніна, часта забалочаная. Есць нафта, вугаль, слюда, графіт, медзь. Клімат арктычны. Ападкаў 150—450 *мм* за год. Расліннасць тундравая. Насельніцтва каля 4 тыс. чал., пераважна эскімосы. Развіты марскі промысел, паляванне, рыбалоўства. Ваенныя базы ЗША.

КАНА́Л у гідратэхніцы (лац. canalis труба, жолаб), адкрыты вадавод з безнапорным рухам вады, зроблены ў грунце для злучэння водных шляхоў зносін або падачы вады



Формы папярочных сячэнняў каналаў: *а* — трапецаідальная; *б* — прамавугольная; *в* — паліганальная; *г* — паўкруглая; *д* — парабалічная; *е* — лагчынападобная.

на гасп. патрэбы. Рэчышча К. ўтвараецца выманнем або насыпаннем грунту. Вада ў К. падаецца самацёкам або з дапамогаю помпавых станцый. Профілі К. разнастайныя (гл. рыс.); у мяккіх грунтах найчасцей трапецаідальныя, у скальных — блізкія да прамавугольнай формы. Памеры папярочнага сячэння К. вызначаюцца гідраўлічным разлікам па яго прапускной здольнасці, дапушчальных скорасцях цячэння, габарытах суднаў і г. д. Адкосы і дно К. замацоўваюць бетоннымі, каменнымі, бітумнымі і інш. пакрыццямі. На трасе К. будуюцца масты, тунелі, шлюзы і інш. Гл. таксама *Гідратэхнічныя збудаванні*.

Адрозніваюць К. суднаходныя, энергетычныя, арашальныя (ірыгацыйныя), абводнільныя, асушальныя, водаправодныя, лесасплаўныя, рыбаводныя, комплексныя (суднаходна-энергетычныя, абводнільна-суднаходныя і г. д.). Суднаходныя К.: злучальныя — злучаюць суднаходныя рэкі, азёры і моры; абводныя — для абыходу нязручных у суднаходстве ўчасткаў рэк, азёраў; падыходныя — для падыходу суднаў да портаў, прыстаняў. Энергетычныя К. прызначаны для падводу вады па турбінах *гідраэлектрычных станцый* (дэрывацыйныя) або адводу ад іх. Ірыгацыйныя К.: магістральныя — падводзяць ваду з водазаборных збудаванняў да тэрыторыі, якая арашаецца; размеркавальныя — разводзяць ваду паміж масівамі; арашальныя. Большасць К. мае комплекснае прызначэнне. Найб. значныя з міжнар. К.: *Суэцкі канал*, *Панамскі канал*, *Кільскі канал*. Самыя вялікія К. у СССР — *Беламорска-Балтыйскі канал*, *Волга-Донскі судналодны канал*, *канал імя Масквы*, *Каракумскі канал*; на Беларусі — суднаходны *Дняпроўска-Бугскі канал*, злучальны канал *Вілейска-Мінскай воднай сістэмы*, менш значныя — *Агінскі канал*, *Аўгустоўскі канал*, *Бярэзінскі канал*.

Літ.: Угинчус А. А. Гидравлические и технико-экономические расчеты каналов, М., 1965; Замарин Е. А. и Фандеев В. В. Гидротехнические сооружения, 5 изд., М., 1965; Использование водной энергии, под ред. Д. С. Щавелева, М.—Л., 1965. *С. Х. Будыка.* Мінск.

КАНА́Л ІМЯ МАСКВЫ (да 1947 канал Масква—Волга), штучны водны шлях, які злучае р. Маскву з Волгай. Пабудаваны ў 1932—37. Пачынаецца на правым беразе Волгі з Волжскага вадасх., за 8 *км* вышэй вусця р. Дубны. Даўж. 128 *км*, з іх 19,5 *км* праходзіць па вадасховішчах (Хімкінскае, Клязьмінскае, Пялаўскае, Учынскае, Пестаўскае, Ікшынскае). 9 шлюзаў, 5 помпавых станцый, 8 ГЭС. Гал. прыстані: Хімкі, Дзмітраў, Дубна. Асн. грузы: лес, нафта, буд. матэрыялы, харч. і прамысл. тавары. Канал забяспечыў Маскву пітною вадой, звязаў горад водным шляхам з морамі, якія абмываюць берагі Еўрап. ч. СССР. Месца адпачынку працоўных Масквы.

Літ.: Соботович И. Д. и Соботович Е. П. По каналу имени Москвы. Путеводитель, М., 1962.

КАНАЛІЗА́ЦЫЯ, сістэма інжынерных збудаванняў для прыёму, ачысткі і выдалення за межы населеных пунктаў сцёкавых водаў; неабходны элемент упарадкаванасці нас. пунктаў, паляпшэння быт. і сан.-гігіен. умоў.

Падзяляецца К. на ўнутраную (К. будынкаў) і вонкавую (К. тэрыторый). Унутраная (рыс. 1) складаецца з сан. прылад — прыёмнікаў (умывальнікаў, ракавін, ваннаў і г. д.) і сеткі ўнутр. каналізацыйных трубаў; вонкавая (рыс. 2) — з сеткі падземных самацёчных трубаў і каналаў, помпавых станцый і напорных вадаводаў, ачысных і



Рыс. 1. Схема ўнутранай каналізацыі: *1* — выцяжная вентыляцыйная труба; *2* — санітарныя прылады — прыёмнікі; *3* — выпускны трубапровод; *4* — пазіральны калодзеж дворавой сеткі; *5* — кантрольны калодзеж; *6* — пазіральны калодзеж вулічнай сеткі.

выпускных збудаванняў. Каналізацыйную сетку пракладваюць па схіле мясцовасці на глыб. 1—8 *м* і больш, у залежнасці ад рэльефу, глыб. прамярзання грунту, дынамічнай нагрузкі транспарту і інш. Выкарыстоўваюцца трубы керамічныя, азбестацэментавыя, бетонныя, жалезабетонныя дыяметрам 150—1500 *мм* і больш. У месцах злучэння

трубаў, на паваротах і на прамых участках (праз 50—150 *м*) робяцца назіральныя калодзежы. Сістэмы К.: агульнасплаўныя — усе сцёкавыя воды (бытавыя, вытворчыя, атмасферныя) выводзяцца па адной сетцы трубаў; раздзельныя — адна сетка трубаў для гаспадарча-фекальных, другая для атм. водаў; паўраздзельныя — функцыянуюць як агульнасплаўныя ў час невялікіх дажджоў і як раздзельныя пры вял. колькасці ападкаў. Калі няма цэнтралізаванай К., для будынкаў з водаправодам робяць мясцовую К., сцёкавыя воды ў ёй ачышчаюцца ў адстойніках (септыках) і на пляцоўках падземнай фільтрацыі. Гл. таксама *Ачыстка сцёкавых водаў*.



Рыс. 2. Схема каналізацыі населенага пункта: РПС — раённая помпавая станцыя; ГПС — галоўная помпавая станцыя; ПП — прамысл. прадпрыемства; АЗ — ачышчальныя збудаванні; *1* — каналізацыйная сетка; *2* — напорны трубапровод; *3* — калектары; *4* — галоўны калектар; *5* — адводны калектар; *6* — выпускны трубапровод.

Літ.: Канализация, под ред. А. И. Жукова, 4 изд., М., 1969; Канализация промышленных предприятий, М., 1969.

КАНАНЕ́НКАЎ Мікалай Іванавіч (н. 1922, в. Перасуха Шчыгроўскага пав. Курскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). На фронце з 1943, сапёр. Вызначыўся ў кастр. 1943 у Лоеўскім р-не Гомельскай вобл. Пад варожым агнём пераправіў на дэсантнай лодцы 75 воінаў, наладзіў паромную пераправу.

КАНАНІЗА́ЦЫЯ (грэч. kanonízō узаконьваю), у хрысціянскай царкве прылічэнне да т. зв. «святых».

У першапачатковым хрысціянстве кожная абшчына мела сваіх святых. Агульнацарк. К. пачалася з 4 ст. У Візантыйскай імперыі праводзілася паводле ўказаў імператара, з 15 ст. патрыярхам і саборамі. У каталіцкай царкве з 12 ст. правам К. валодаюць рымскія папы. Агульнацарк. К. ў рус. праваслаўнай царкве ўведзена ў 16 ст. К.— сродак паліт. ўздзеяння на веруючых у інтарэсах рэакц. сіл.

Літ.: Ранович А. В. Как создавались жития святых, М., 1961.

КАНАНІ́ЧНАЕ ПРА́ВА, сукупнасць царкоўных правілаў (канонаў), якія рэгулююць унутрыцаркоўную арганізацыю, узаемаадносіны царквы і дзяржавы, царкоўных служак і пекаторыя пытанні жыцця веруючых. Крыніцы К. п.— пастановы царк. сабораў, у каталіцкай царкве — і пастановы папаў рымскіх.

Было пашырана ў феад. дзяржавах Зах. Еўропы, асабліва ў галіне сямейна-шлюбных адносін. У царскай Расіі К. п. дзейнічала пераважна ва ўнутрыцарк. узаемаадносінах. Упершыню кадыфікавана ў 12 ст. балонскім манахам Грацыянам. У 16 ст. складзены збор К. п.— Корпус юрыс кананіцы. Садзейнічала абароне феад. ладу і ўмацаванню рэакц. асноў у сац. жыцці і паліт. сістэме дзяржаў. З утварэннем бурж. дзяржаў сфера яго дзеяння скарацілася. У 1917 папа Бенядзікт XV выдаў кодэкс К. п., у якім рэгулююцца ўнутр. адносіны каталіцкай царквы. У цяперашні час дзейнічае на тэрыторыі Ватыкана і дзяржаў (Партугалія, Іспанія, Італія), якія заключылі з Ватыканам пагадненні па пытаннях прававога становішча каталіцкай царквы.

Літ.: Мараш Я. Н. Ватикан и католическая церковь в Белоруссии (1569—1795), Мн., 1971; Мэнхэттен А. Ватикан. Католическая церковь — оплот мировой реакции, пер. с англ., М., 1948. *Л. В. Паўлава.* Мінск.

КАНАНО́ВІЧ Іпаліт Сільвестравіч [н. 8(21).4.1908, в. Кукавічы Слуцкага пав. Мінскай губ.], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на Беларусі ў Айчынную вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1931. Скончыў Вышэйшую парт. школу пры ЦК КПСС (1953). У 1929 старшыня камуны ў в. Кукавічы, у 1930—35 у Чырв. Арміі, з 1935 на сав. і парт. рабоце. З ліп. 1941 на фронце. У партызанах з сак. 1943 — упаўнаважаны БШПР, камісар *партызанскай брыгады імя В. П. Чкалава № 64*, адначасова сакратар Слуцкага раённага, чл. Мінскага абласнога падпольных к-таў КП(б)Б. Пасля вайны сакратар Слуцкага раённага, Бабруйскага абласнога к-таў КПБ, старшыня Гродзенскага аблвыканкома, нам. старшыні камісіі дзярж. кантролю Савета Міністраў БССР. З 1963 на прафс. рабоце. На XX—XXII, XXIV—XXV з'ездах КПБ выбіраўся чл. ЦК, на XIX і XXVI — чл. Рэвіз. камісіі КПБ. Дэп. Вярх. Савета СССР 5-га скл., Вярх. Савета БССР 3—4-га скл. Ганаровы грамадзянін Слуцка. Узнаг. ордэнам Леніна, 5 інш. ордэнамі, медалямі. Жыве ў Мінску.

КАНАНО́ВІЧ Канстанцін Юльянавіч [26.11 (8.12).1872, в. Грабаўка Гомельскага пав. Магілёўскай губ.— 15.3.1954], беларускі савецкі ўрач-аталарынголаг і вучоны ў галіне санітарыі і эпідэміялогіі. Скончыў Кіеўскі ун-т (1899). Працаваў у Гомельскім пав., Гомелі, Магілёве. Арганізатар першай у СССР Гомельскай санітарна-эпідэміялагічнай станцыі (1922). Удзельнік Айч. вайны. Асн. працы па арганізацыі аховы здароўя, санітарна-эпідэміялагічнай справе, аталарынгалагічных хваробах. Узнаг. ордэнам Леніна, медалямі.

Тв.: Земско-врачебная организация Могилевской губернии и ее деятельность за 1905 год, Могилев, 1907; Сан.-эпид. организация Гомельской губернии и ее деятельность за 1924 г., «Гигиена и эпидемиология», 1925, № 4; Предупреждай болезни носа, горла и уха, Гомель, 1930.

Літ.: Беляцкий Д. П. Константин Юлианович Кононович, «Здравоохранение Белоруссии», 1970, № 3.

КАНАНО́ВІЧ Любоў Іванаўна (н. 11.11.1932, в. Галева Пінскага пав. Палескага ваяводства), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1971). У 1950—52 палявод, з 1952 даярка калгаса «Аснежыцкі» Пінскага р-на Брэсцкай вобл. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, медалямі.

КАНАПЕ́ЛЬКА Зінаіда Ігнатаўна (н. 25.12.1918, в. Багушэўск Сенненскага пав. Магілёўскай губ.), беларуская савецкая актрыса. Засл. арт. БССР (1954). Чл. КПСС з 1956. Пасля заканчэння студыі пры БДТ-2 (1938) актрыса т-ра імя Я. Коласа. Выканаўца лірыч-

ка-драм. і востраха-рактарных роляў. Яркасць і дакладнасць распрацоўкі характараў, эмацыянальнасць, праўдзівасць вызначаюць мастацтва К. Стварыла вобразы беларускіх дзяўчат і жанчын: Насця («Несцерка» В. Вольскага), Галя («Алазанская даліна» К. Губарэвіча і І. Дорскага), Насця Вярбіцкая («Пяюць жаваранкі» К. Крапівы), Дуня («Простая дзяўчына» Губарэвіча), Кацярына («Лявоніха» П. Данілава), Паліна («Трыбунал» А. Макаёнка). З інш. роляў: Ганерылья («Кароль Лір» У. Шэкспіра), Мар'я Антонаўна («Рэвізор» М. Гогаля), Маці («Ветрык, вей!» Я. Райніса), Лізавета («Марыя Сцюарт» Ф. Шылера), Соф'я Кічыгіна («Шануй бацьку свайго» В. Лаўрэнцьева), Разалія Паўлаўна («Клоп» У. Маякоўскага).

КАНАПЕЛЬКА Пётр Якаўлевіч (н. 10.2. 1922, в. Гнаткі Стара-Канстанцінаўскага пав. Валынскай губ.), беларускі савецкі вучоны ў галіне ветэрынарыі. Д-р вет. н. (1968), праф. (1970). Чл. КПСС з 1944. З 1954 у Віцебскім вет. ін-це: дэкан вет. ф-та (з 1969), заг. кафедры клінічнай дыягностыкі (з 1971). Працы па хваробах коней і маладняку с.-г. жывёл, пытаннях этыялогіі, патагенезу, ранняй дыягностыкі, тэрапіі, прафілактыцы рахітаў, а таксама тэтаніі парасят.

Тв.: Предупреждение незаразных болезней поросят, Мн., 1962; (разам з Ф. Ф. Порахавым і М. А. Уразаевым) Незаразные болезни молодняка сельскохозяйственных животных. Профилактика и лечение, Мн., 1969.

КАНАПЛЯНКА (Acanthis cannabina), птушка сям. ўюрковых атр. *вераб'іных*. Пашырана ў Еўропе, Зах. Азіі і Паўн. Афрыцы. У СССР залятае на У ад Алтая. На Беларусі гняздуецца і трапляецца на пералётах. У паўд. частцы рэспублікі бывае зімою.

Даўж. цела К. каля 13 *см*, маса да 20 *г*. Апярэнне шэра-карычневае. Вясной і летам у самцоў ярка-чырвоныя грудзі і чырванаватая «шапачка». Жыве на ўзлесках, у садах, парках, каля будынкаў. Гняздо пераважна ў кустах. Нясе (двойчы на год) 4—6 яец. Корміцца насеннем травяністых раслін і насякомымі.

КАНАПНІЦКАЯ (Konopnicka) Марыя (23.5. 1842, г. Сувалкі — 8.10.1910), польская пісьменніца. З сям'і юрыста. У 1884—86 рэдагавала дэмакр. жаночы час. «Swit» («Золак»). У 1888 наведала Беларусь. З 1890 жыла за мяжою. Пачала друкавацца ў 1875. Асн. матывы творчасці К.— сялянская нядоля, жыццё гарадской беднаты, любоў да радзімы, вера ў народ, у надыход справядлівасці і свабоды. Яе паэзіі ўласцівыя дэмакратызм, спалучэнне лірычнай і публіцыст. плыняў, бліскасць да фальклору (аб. «Паэзіі», сер. 1—4, 1881—96; «Лініі і гукі», 1897; «Італія», 1901; «Людзям і часу», 1904; і інш.). У эпічнай паэме «Пан Бальцэр у Бразіліі» (1892—1906, поўн. выд. 1910) пра трагічны лёс польскіх сялян-эмігрантаў К. паказала веліч народа, яго патрыятызм, нянавісць да класавых ворагаў, станаўленне характараў змагароў за нар. шчасце. Найлепшыя часткі паэмы «У порце», «Ідзём...» напісаны пад уражаннем рэв. 1905—07. Аўтар зб. апавяданняў «Чатыры навелы» (1888), «Маі знаёмыя» (1890), «На дарозе» (1893), «Навелы» (1897), «На парманскім беразе» (1904), аповесці для дзяцей «Пра гномаў і сіротку Марысю» (1896), кн. «Міцкевіч, яго жыццё і душа» (1899). У апавяданні «З узломаў» (1892) намалявала бязрадасную карціну жыцця бел. вёскі. Вершы К. на бел. мову перакладалі Я. Купала, А. Вялюгін, С. Дзяргай, прозу — Я. Брыль, В. Каваль.



Тв.: Бел. пер.— Дым, Вільня, 1908; Мандэль Гданскі.— Ісайка [К. Станюковіча], Мн., 1930; Пра гномаў і сіротку Марысю, Мн., 1957; рус. пер.— Соч., т. 1—4, М., 1959.

Літ.: Пиотровская А. Г. Творческий путь М. Конопницкой, М., 1962; Леж. Мария Конопницкая и русская литература, у кн.: Из истории связей славянских литератур, М., 1959; Мария Конопницкая. Биобиблиогр. указатель, М., 1962; Sladami życia i twórczości Marii Konopnickiej, Warszawa, 1966.

В. С. Семяняко́ў. Мінск.

КАНАРСКІ (Konarski) Станіслаў (сапр. ім Еранім Францішак; 30.9.1700, Жарчыцы Большыя каля Енджэева — 3.8.1773), польскі асветнік, педагог і публіцыст. Рэфарматар *піярскіх школ* на тэр. Польшчы, Беларусі, Літвы. Надаваў вял. значэнне вывучэнню роднай мовы і прыродазнаўства, абгрунтоўваў неабходнасць эстэт. і фіз. выхавання дзяцей, правядзення практ. работ за кошт скарачэння курса тэалогіі, прытрымліваўся думкі, што школа павінна даваць не толькі веды, але і выхоўваць чалавека-грамадзяніна.

Тв.: Wybór pism politycznych, Kraków, [1925].

Літ.: Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі, Мн., 1968.

Э. К. Дарашэвіч. Мінск.

КАНАРСКІ (Konarski) Шыман (5.3.1808, Дабкішкі Аўгустоўскага пав.— 27.2.1839), польскі рэвалюцыянер. З шляхты. Актыўны ўдзельнік паўстання 1830—31. У канцы 1831 разам з паўстанцкім атрадам эміграваў за мяжу. У 1833 удзельнічаў у партыз. экспедыцыі ў Каралеўстве Польскім. Разам з І. *Лялевелем* стварыў арг-цыі «Маладая Польшча» (1834) і «Садружнасць польскага народа» (1835). Выступаў за вызваленне сялян, змагаўся супраць самадзяржаўя, за незалежную рэсп. Польшчу. Прытрымліваўся ідэй дзекабрыстаў. У канцы 1834 з Я. Чынскім у Парыжы выдаваў двухтыднёвік «Pólnoc» («Поўнач»), які прапагандаваў неабходнасць супольнай рэвалюц. барацьбы польск. і рус. народаў. Як эмісар «Маладой Польшчы» летам 1835 вярнуўся ў Кракаў, потым нелегальна ў Расію. За два гады стварыў на Украіне і Беларусі некалькі тайных ячэек «Садружнасць польскага народа». У іх уваходзілі шляхецкая інтэлігенцыя і навучэнцы. Сялянства не залучалася. У гэтым выявілася абмежаванасць К. Падзяляў прынцыпы бурж. дэмакратаў пра «гармонію інтарэсаў» шляхты і сялянства. Для сувязі з рус. рэвалюцыянерамі двойчы ездзіў у Пецярбург. Наладзіў сувязь з афіцэрамі і салдатамі 1-й (дзейнай) арміі, якая размяшчалася ў гарадах Беларусі і Вільні. У маі 1838 арыштаваны.

Група рус. афіцэраў на чале з падпаручнікам А. П. Кузьміным-Караваевым арганізоўвала ўцёкі К. Але здрадніцтва разбурыла іх планы. Расстраляны ў Вільні.

Літ.: Вержбицкий В. Г. О выступлении русского офицера Кузьмина-Караваева и его товарищей в защиту польского революционера Ш. Конарского, «Уч. зап. Ин-та славяноведения АН СССР», 1962, т. 25.

В. С. Семяняко́ў. Мінск.

КАНАРЧЫК Аляксандр Іванавіч (1904, в. Пірагоўка Праскураўскага пав. Падольскай губ.— 24.8.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). У Сав. Арміі з 1933. На фронце з 1941, камандзір асобнага матарызаванага пантонна-маставога батальёна. Вызначыўся на тэр. Магілёўскай вобл. ў чэрв. 1944. Батальён на чале з К. пад агнём праціўніка навёў пераправу цераз Дняпро каля в. Дабрэйка і гэтым забяспечыў пераправу сав. войск. За аперацыю батальёну нададзена найменне «Верхнедняпроўскі». Загінуў у баі, пахаваны ў г. п. Воранава Гродзенскай вобл.

КАНАРЭЙЧЫК Уладзімір Рыгоравіч [н. 12(25). 6.1915, ст. Сафіеўка Аляксандраўскага пав. Екацярынаслаўскай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1944. На флоце з 1939, старшына 2-й статці. Вызначыўся ў чэрв.— ліп. 1944 у час наступлення Дняпроўскай ваен. флатыліі па р. Прыпяць, у 5 дэсантных аперацыях у р-нах Скрыгалава, Белановічаў, Петрыкава і Пінска. У баі за Пінск група дэсантнікаў на чале з К. знішчыла 2 дзоты, вызваліла 200 ваеннапалонных чырвонаармейцаў, разам з інш. часцямі адбіла 27 варожых контратак. Жыве ў Пінску.

КАНАРЭЙКА, канарэечны ўюрок (Serinus canaria), птушка сям. ўюрковых атр. вераб'іных. Пашырана на Канарскіх, Азорскіх а-вах, в-ве Мадэйра, у паўн.-зах. Афрыцы, Малой Азіі і Еўропе. Расселяецца на У. У межах СССР паявілася ў 20 ст. Есць на Украіне, у Літве, Эстоніі, на Беларусі.



Даўж. цела К. 12—14 *см*, маса 11—14 *г*. Апярэнне зеленавата-жоўтае з цёмнымі падоўжнымі плямкамі. Жыве ў культурных ландшафтах. Гняздуецца ў густых кронах дрэў. Нясе 4—6 яец. Корміцца раслінным кормам і насякомымі. Завезена ў Еўропу ў канцы 15 ст. і разводзіцца ў хатніх умовах. Добра пяе. Непатрабавальная да ўмоў. Размнажаецца ў няволі. Выведзена шмат разнастайных парод пакаёвых канарэек.

Літ.: Вёме Л. Б. Жизнь птиц у нас дома, 2 изд., М., 1968; Долбик М. С. и Рубин Ф. Е. К расширению ареала новых и малоизвестных в Белоруссии птиц, у кн.: Экология позвоночных животных Белоруссии, Мн., 1965.

КАНАТ, 1) К. пяньковы — тоўстая вяроўка, скручаная з асобных пасмаў, т. зв. ліцаў, якія ў сваю чаргу скручаны з нітак пражы — каболак. 2) К. ланцуговы — якарны сталёвы ланцуг на суднах. 3) К. сталёвы — складаецца са сталёвых дратоў, пэўным чынам звітых (скручаных) у пасмы, якія ў сваю чаргу звітыя вакол асяродка з раслінага валакна або з дроту, азбесту, капрону і інш.

К. сталёвыя звіваюць (гл. рыс.) у адну (спіральныя, *1*), дзве (тросы, *2*) і тры (кабелі, *3*) сталі. Падзяляюць К. сталёвыя: паводле прызначэння (груза-людскія, грузавыя і бензельныя), паводле напрамку дратоў у пасмах (адна-бакоўкі ці паралельны, крыжавы ці сустрэчны, камбінаваны) і саміх пасмаў у канаце (правы, левы), паводле формы папярочнага сячэння (круглапрадныя, авальныя, трохгранныя), паводле характару кантакту дратоў у пасме (кропкавага і лінейнага датыкання). К. сталёвыя падзяляюцца таксама паводле структуры, якая вызначаецца колькасцю пасмаў у канаце, дратоў у кожнай пасме і ва ўсім канаце, колькасцю асяродкаў. Пашыраецца выкарыстанне сталёвых К., якія не раскручваюцца (звіваюцца з папярэдне дэфармаваных дратоў і пасмаў).



Літ.: Справочник по кранам, под ред. А. Н. Дукельского, т. 2, М.— Л., 1962; Справочник машиностроителя, под ред. Н. С. Ачеркана, т. 4, кн. 2, М., 1963; Таубер Б. А. Подъемно-транспортные машины, 3 изд., М., 1970.

КАНАШЫ, возера ў бас. р. Тураўлянкі, левага прытока Зах. Дзвіны, у Полацкім р-не Віцебскай вобл. Пл. 0,58 *км*². Даўж. 1 *км*, найб. шыр. 0,8 *км*, сярэднял 0,58 *км*, найб. глыб. 10 *м*. Катлавіна сярод узгоркаў, выцягнута з ПнЗ на ПдУ. Вадазбор (22,5 *км*²) узгорысты і паката-хвалісты. К. слаба праточнае, злучана ручаём з воз. Гомель і пратокай з воз. Усомля. Водзяцца плотка, акунь, карась, шчупак, лешч, лінь.

КАНАШЫ, вёска ў Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл., на беразе воз. Плаў. Цэнтр сельсавета і калгаса «Радзіма». За 42 *км* на У ад Гарадка, 40 *км* ад Віцебска. 100 ж., гасп. 34 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, магазін. З вёскамі Малгаці (43 ж., гасп. 18) і Гарадок (67 ж., гасп. 19) фактычна ўтварае адзін населены пункт.

У Вял. Айч. вайну каля К. базіравалася 1-я Беларуская партыз. брыгада (камандзір М. П. Шмыроў). У час карнай аперацыі 1.5.1942 ням.-фашысты расстралялі 30 жыхароў в. Гарадок, у в. Малгаці спалілі жывымі 69 жыхароў. У час другой карнай аперацыі поўнасцю спалілі К. і в. Гарадок, загубілі ўсіх жыхароў, якія не паспелі ўцячы ў лес пад ахову партызан. Частка насельніцтва в. Гарадок загінула ў час карнай аперацыі і блакады партыз. зоны ў сак. 1943. У вер. 1943 ням.-фаш. захопнікі чацвёрты раз правялі карную аперацыю, спалілі ўсе адбудаваныя зямлянкі ў К. і навакольных вёсках, працаздольнае насельніцтва (32 чал.) вывезлі на катаржныя работы ў Германію, астатніх расстралялі. Усяго фашысты загубілі ў в. Гарадок, Малгаці і Канашы 314 чал. Помнік на брацкай магіле 53 сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны.

В. І. Шчамялёў. Гарадоцкі раён.

КАНАШЭНКА Сцяпан Мікалаевіч (1909, в. Узніца Полацкага пав. Віцебскай губ.— 25.9.1943), Герой Сав. Саюза (1944). У Чырв. Арміі і на фронце з 1942. Вызначыўся каля г. Канеў. У ноч на 24.9.1943 старшына К. на чале групы разведчыкаў пераправіўся цераз Дняпро, захапіў плацдарм і больш за суткі вёў баі з ворагам. Загінуў у Дняпры пры спро-



бе перабрацца на левы бераг, каб паведаміць камандаванню пра становішча на плацдарме.

КАНБЕРА (Canberra), сталіца Аўстралійскага Саюза, цэнтр федэральнай сталічнай акругі. Размешчана на ПдУ краіны, у перадгор'ях Аўстралійскіх Альп. Вузел аўтамаб. дарог. Аэрапорт. 137 тыс. ж. (1970). Паліт. і фін. цэнтр: урадавыя ўстановы, прадстаўніцтвы манапалістычных аб'яднанняў, фірмаў, банкаў. Ун-т, АН.

КАНВЕЕР (англ. conveyer ад convey перавозіць), **транспарцёр**, стацыянарная ці перасоўная машына бесперапыннага дзеяння,

Тыпы канвеераў: *1* — стужачны (стацыянарны і перасоўны); *2* — пласціністы; *3* — скрабалкавы; *4* — вінтавы; *5* — чарпаковы элеватар; *6* — падвясны ланцуговы.





якая перамяшчае масавыя грузы, не спыняючыся на загрузку і разгрузку. К. шырока выкарыстоўваюцца таксама пры зборцы машын, у ліцейнай вытворчасці і г. д.

Паводле віду прывода К. бываюць механічныя, пнеўматычныя, а таксама самацёчныя (гравітацыйныя), у якіх груз перамяшчаецца ад сілы цяжару. У залежнасці ад характару рухальнай сілы і канструкцыйных адзнак К. падзяляюцца на дзве групы: з гнуткім цягавым элементам (стужачны, пласціністы, скрабалкавы, скрабалка-чарпаковы, калыскавы, цялежкавы і інш.) і без яго (вінтавы, ролікавы, вібрацыйныя і вярчальныя транспартныя трубы). Апошнім характарны паступальны рух грузу пры вярчальным ці вагальным руху рабочых элементаў К. Паводле характару работы К. падзяляюцца на транспартныя і тэхналагічныя (зборачныя, ліцейныя, сартавальныя і інш.). К.— адна з тэхн. асноў механізацыі тэхнал. працэсаў і арганізацыі бесперапыннай паточнай вытворчасці.

Літ.: Машины непрерывного транспорта, под ред. В. И. Плавинского, М., 1969; Спиваковский А. О. и Дьячков В. К. Транспортирующие машины, 2 изд., М., 1968.

Ю. І. Свіршчэўскі. Мінск.

КАНВЕКЦЫЯ (лац. convectio дастаўка), перанос цяпла, абумоўлены перамешваннем нагрэтых мас вадкасці або газу. К. ў атмасферы — узыходныя і сыходныя токі паветра, якія перамешваюць яго ў верт. напрамку.

Узнікае пры значным праграванні паветра на падысподняй паверхні; пры *адвекцыі* халоднага паветра; пры хуткім яго ахалоджванні ночу над цёплай паверхняй мора. К. ў моры выклікаецца зменай шчыльнасці марской вады, зменай т-ры або салёнасці. К. выкарыстоўваецца ў быце (цэнтр. ацяпленне, награванне вадкасці і г. д.).

КАНВЕЛІШКІ, вёска ў Воранаўскім с/с Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Мічурына. За 21 *км* на ПнУ ад Воранава, 154 *км* ад Гродна, 9 *км* ад чыг. ст. Беняконі, на аўтамаб. дарозе, якая злучае вёску з Воранавам. 170 ж., гасп. 55 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, вет. пункт, аддз. сувязі, сталовая, магазін.

КАНВЕНЦЫІ МІЖНАРОДНЫЯ (лац. conventio пагадненне, дагавор), від міжнародных дагавораў, якія звычайна заключаюцца па спец. пытаннях эканамічнага, тэхнічнага, сацыяльнага, працоўнага, грамадзянска-прававога, ваеннага і інш. характару. Бываюць двухбаковыя і шматбаковыя, закрытыя і адкрытыя. Адкрытыя дапускаюць далучэнне да іх інш. дзяржаў. К. м. заключаюцца, набываюць сілу, як і *дагаворы міжнародныя*.

Найбольш значныя — *Брусельскія канвенцыі*, *Гаагскія канвенцыі* пра законы і звычаі вайны, *Жэнеўскія канвенцыі*. Пад уплывам ідэй Кастрычніка развіваліся прагрэс. прынцыпы ў міжнар. праве і былі заключаны шматбаковыя канвенцыі па пытаннях аховы правоў чалавека і барацьбе са злачыннасцю. Пасля 2-й сусв. вайны заключаны К. м. па барацьбе з генацыдам, гандлем людзьмі, прастытуцыяй, пра палітычныя, шлюбна-сямейныя і інш.; правы жанчын, пра ліквідацыю ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі і інш. СССР — удзельнік названых вышэй шматбаковых канвенцый. БССР ратыфікавала больш за 70 шматбаковых К. м.; яна — адна з ініцыятараў прыняцця Канвенцыі пра неўзнывальнасць тэрміну даўнасці да ваенных злачынцаў і злачынстваў супраць чалавецтва (26.11.1968). Імперыял. дзяржавы пастаянна парушаюць падпісаныя імі К. м. Прыклады такіх парушэнняў — агрэсія ЗША ў В'етнаме, ізраільская агрэсія супраць арабскіх народаў на Б. Усходзе.

Літ.: Лукашук И. И. СССР и международные договоры, М., 1961; Шуршалов В. М. Основные договоры, М., 1957.

вання действительности международных договоров. *Г. І. Цернавая.* Мінск.

«КАНВЕРГЕНЦЫІ ТЭОРЫЯ», бурж. антыкамуністычная канцэпцыя пра нібыта паступаннае збліжэнне капіталізму і сацыялізма пад уздзеяннем навукова-тэхн. рэвалюцыі і ўзнікненне на гэтай аснове адзінай сацыяльнай сістэмы. Мэта: сказіць змест сучаснай эпохі і тэндэнцый яе развіцця, дыялектыку развіцця сацыялізма на сучасным этапе, адцягнуць працоўных ад рэвалюц. барацьбы, прадоўжыць існаванне капіталізму.

Тэрмін узяты з біялогіі (гл. *Канвергенцыя*). Паводле «К. т.» (прадстаўнікі: амер. У. Бакінгем, Д. Бел, Дж. Голбрэйс, П. Сарокін, франц. Р. Арон, Ж. Фурасцье, галанд. Ян Тынберген і інш.) з развіццём тэхн. прагрэсу знікаюць адрозненні паміж капіталізмам і сацыялізмам, спараджаюцца аднатыпныя элементы як у эканоміцы, так і ў культуры, ідэалогіі. «К. т.», як і інш. падобныя бурж. тэорыі: «*індустрыяльнага грамадства*» (гл. *«Адзінае індустрыяльнае грамадства»*), «стадыйнага развіцця грамадства», «гібрыднага грамадства»,— абсалютызуе ролю тэхнікі, развіццё прадукцыйных сіл разглядае ў адрыве ад вытв. адносін і іх асновы — формаў уласнасці на сродкі вытворчасці. Бурж. сутнасць тэорыі асабліва відавочная ў сцвярджанні, што будучае грамадства быццам бы захавае ў сваёй аснове прыватную ўласнасць з яе рынкавым механізмам і пагоняй за прыбыткам. На самай справе паглыбленне агульнага крызісу капіталізму, вопыт і поспехі сацыяліст. краін сведчаць пра тое, што толькі карэнная сацыяльная перабудова капіталіст. грамадства дае магчымасць ліквідаваць супярэчнасці капіталізму.

Літ.: Энгельс Ф. Письмо В. Боргиусу в Бреславль, 25.1.1894 г., Соч., т. 39, с. 174—177; Маркс К. і Энгельс Ф. Маніфест Камуністычнай партыі, Мн., 1968; Ленін У. І. Аб карыкатуры на марксізм і аб «імперыялістычным эканамізме», Тв., т. 23 (Полн. собр. соч., т. 30); Смоляницкий В. Г. Экономические концепции «синтеза», М., 1969; Современные буржуазные теории о слиянии капитализма и социализма, М., 1970; Давідзюк Г. П. Марксісцкая ідэалогія і буржуазная дэідэалагізацыя, Мн., 1970.

А. А. Гаеўскі, Г. П. Давідзюк. Мінск.

КАНВЕРГЕ́НЦЫЯ (ад лац. convergo набліжаюся), 1) у этнаграфіі — тэрмін, якім абазначаюцца аднолькавыя ці падобныя культурныя з'явы, што ўзніклі па агульных законах развіцця грамадства незалежна адна ад адной, напр. самастойнае ўзнікненне земляробства на тэр., якія не мелі сувязі паміж сабою (Азія і Амерыка). 2) У мовазнаўстве — працэс, які характарызуецца развіццём падобных рысаў (часам яны супадаюць) у дзвюх ці некалькіх мовах, якія кантактуюцца, але могуць быць зусім розныя паводле паходжання.

У апісальнай фанетыцы — супадзенне ў пэўнай пазіцыі двух ці болей гукаў у адным гуку. Напр., супадзенне гукаў «б» і «п» перад глухімі і на канцы слова ў адным гуку «п»: «бабка» і «шапка», «грыб» і «грып». У гістар. фанетыцы — супадзенне двух ці болей гукаў у адным гуку ў працэсе гістар. развіцця: напр. у бел. мове супадзенне старажытнарускіх гукаў «ѣ» і «е» ў адным гуку «е»: «мѣсяц» і «вечар».

КАНВЕРГЕ́НЦЫЯ (у біялогіі), незалежнае набыццё падабенства далёкімі па паходжанні арганізмамі ў выніку прыстасавання іх да аднолькавых умоў існавання. Канвергентнае падабенства найчасцей закранае асобныя органы і абумоўлена падабенствам іх функцый, радзей ахоплівае ўвесь арганізм.

Канвергентнымі з'яўляюцца тарпедападобная форма цела, размяшчэнне і форма плаўнікоў у акулы (рыба), іхтыязаўра (вымерлы паўзун), дэльфіна (млекакормячае), мікраскапічная будова хіцінавых утварэнняў насякомых і касцей вышэйшых жывёл. У выніку фізіял. К. лісце насякомаедных раслін (напр., расянкі) выпрацоўвае фермент, падобны да стрававальных ферментаў жывёл. К. амаль не ўплывае на эвалюцыю арган. формаў. Гал. роля ў эвалюцыі належыць *дывергенцыі*.

Літ.: Шмальгаузен И. И. Проблемы дарвинизма, 2 изд., Л., 1969. *У. К. Сайчанка.* Мінск.

КАНВЕРТАР (англ. converter ад лац. converto паварочваю, пераўтвараю), металургічны агрэгат (від печы) для выплаўкі сталі з вадкага чыгуну, а таксама для атрымання чарнавой медзі і т. зв. файнштэйну (прадукту для вырабу пікелю) прадзіманнем паветра або кіслароду праз расплаў. Ёмістасць К. да 130 *т*, будуюцца (1972) да 300 *т*. Сталеплавільны цэх з трох 250-тонных К. можа выплавіць да 4 млн. *т* сталі за год. Гл. таксама ў арт. *Бесемераўскі працэс*, *Тамасаўскі працэс*.

Літ.: Жигулин В. И. Развитие кислородно-конверторного производства стали, Днепропетровск, 1967; Майоров А. И. Кислородные конвертеры большой емкости в СССР и за рубежом, М., 1968.

КАНГАЛЁЎ Фёдар Іванавіч (н. 1922, в. Дзербіна Краснінскага пав. Смаленскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). На фронце з 1941. Вызначыўся ў Лоеўскім р-не Гомельскай вобл. 30.9.1943 у наступленні на в. Хомінка, на правым беразе Сажа, знішчыў 2 кулямёты, першы ўварваўся ў варожыя траншэі. 19.10.1943 з групай разведчыкаў пераправіўся цераз Дняпро і разведаў абарону ворага на ўчастку Мохаў — Дняпроўская Камуна, што дало магчымасць дывізіі без страт фарсіраваць раку. Жыве ў г. Мсціслаў Магілёўскай вобл.

КАНГЕЛА́РЫ Валянцін Аляксандравіч (30.6.1883, Керч — 26.11.1937), удзельнік грамадз. вайны на Беларусі, узнаг. ордэнам Чырв. Сцяга. З службовых. Чл. КПСС з мая 1917. Скончыў Харкаўскі ун-т (1910). Удзельнік 1-й сусв. вайны. З 1918 на Усх. фронце. З 1920 на Зах. фронце — у штабе фронту і 3-й арміі, нач. 10-й стралк. дывізіі. Вызначыўся ў баях супраць бандаў Булак-Балаховіча 8—25.11.1920 у р-не Скрыгалава, Мазыра і Рэчыцы. У час ліквідацыі Кранштацкага мяцяжу пам. камандуючага Паўн. групы войск. З 1930 нач. Ваен.-мед. акадэміі, з 1934 нам. наркома аховы здароўя РСФСР. Узнаг. 2 ордэнамі Чырв. Сцяга.

КАНГЛАМЕРА́Т у геалогіі (ад лац. conglomeratus збіранне, нагрувашчванне), сцэментаваная асадкавая абломкавая горная парода (гл. *Абломкавыя горныя пароды*), складзена пераважна са згладжаных абломкаў горных парод (галькі з прымессю пяску, жвіру і валуноў). Можа складацца з галькі розных парод (паліміктавы К.) ці з адной пароды (манаміктавы К.). Цэментам служаць гліністы часцінкі, вуглякіслы кальцый, крамянязём і інш.

КАНДАЛЬ-ЯЛОВЕЦ-ВОЛЬХАВА, тарфяны масіў на стыку Лельчыцкага, Жыткавіцкага і Петрыкаўскага раёнаў Гомельскай вобл. Разам з тарфянікам *Межч* складае адзіную затарфаваную старарэчную прытэрасную даліну. У раслінным покрыве пераважаюць хвоя, бяроза, вольха (на аблесеных участках), ба-

гульнік, трыснёг, асака, разнатраўе і імхі (сфагнавыя і гіпнавыя). Пл. 26 862 *га*, запасы торфу-сырцу 329,6 млн. $м^3$. Тарфяны пакład вярховага, пераходнага і нізіннага тыпу, складзены трыснягова-асаковым, асаковым, драўняна-пераходным, хваёва-падвейным і сфагнавым відамі торфу. Нізінныя тарфы маюць ступень распаду 35—40%, хваёва-падвейныя — 40—45, сфагнавыя — 5—25%. Значная частка ўваходзіць у *Прыпяцкі дзяржаўны ландшафтна-гідралагічны запаведнік.*

КАНДЗІНСКІ Васіль Васілевіч [4(16).12. 1866, Масква — 13.12.1944], рускі жывапісец. Адзін з лідэраў мадэрнісцкага індывідуалістычнага мастацтва і заснавальнікаў аб'яднання экспрэсіяністаў «Сіні конік» у Мюнхене (1911), пачынальнік абстрактнага мастацтва, у 1910 выканаў першую абстрактную кампазіцыю. Вучыўся ў Мюнхене (1897—1900), у 1907—14 і ў 1921—33 працаваў у Германіі, з 1933 у Францыі; у 1918—21 выкладаў у Маскве, у 1922—33 — у Вышэйшай школе буд-ва і маст. канструявання «Баўхаўз» у Германіі. Іл. гл. ў арт. *Абстракцыянізм.*

Літ.: Модернизм. М., 1969.

КАНДРАТОВІЧ Людвік, гл. *Сыракомля* Уладзіслаў.

КАНДРАЦЁНКА Міхаіл Барысавіч (н. 5.5. 1924, в. Трыпіўкі Віцебскага пав.), перадавік тарфяной прамысловасці, Герой Сац. Працы (1971). Чл. КПСС з 1964. Удзельнік партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. З 1958 машыніст торфаздабыўнога экскаватара торфапрадпрыемства «Дабееўскі Мох» Шумілінскага р-на Віцебскай вобл. Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі.

КАНДРАЦЁНКА Пётр Ягоравіч (н. 1923, в. Ажогіна Парэцкага пав. Смаленскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). На фронце з 1941, сапёр. Вызначыўся 23—27.6.1944 пры прарыве варожай абароны непадалёку ад Віцебска. Перад наступленнем зрабіў 4 праходы ў драцяной загародзе, зняў 387 мін. У час атакі першы ўварваўся ў варожую траншэю, знішчыў агнявую кропку, узяў у палон 24 гітлераўцаў. З трафейных машын зняў 22 міны-сюрпрызы. Жыве ў Салікамску.

КАНДРАЦЁНКА Раман Ісідаравіч [30.9(12. 10).1857, Тыфліс — 2(15).12.1904], рускі ваенны дзеяч, ген.-л., герой абароны Порт-Артура. З сям'і афіцэра. Скончыў Полацкую ваен. гімназію, інж. акадэмію (1882) і Акадэмію Ген. штаба (1886). З 1877 служыў на Каўказе, у штабе Віленскай ваен. акругі, ва ўпраўленні Мінскай мясцовай брыгады (1888). Належаў да прагрэс. часткі каманднага саставу царскай арміі. З 1903 камандзір брыгады, дывізіі, а з пачаткам рус.-яп. вайны 1904—05 адначасова нач. сухапутнай абароны Порт-Артура. Стварыў сістэму абароны; пад кіраўніцтвам К. адбіты 4 штурмы крэпасці. Заахвочваў афіцэраў і салдатаў ствараць і выкарыстоўваць новыя віды ўзбраення. Загінуў пры абароне Порт-Артура. Пахаваны ў Аляксандра-Неўскай лаўры (Пецярбург). Яго імем былі названы полк і мінаносец; яму былі пастаўлены помнікі ў Пецярбурзе (на магіле і ў зале інж. вучылішча), у Сувалках, Полацку (кадэцкі корпус).

Літ.: Миткевич В. и Дубенский Д. Р. И. Кондратенко. Его жизнь и боевая деятельность, [СПб., 1908]; Сорокин А. И. Оборона Порт-Артура, 3 изд., М., 1954 (бібліягр.).
М. І. Камінскі. Мінск.

КАНДРАЦКІ (Kondracki) Ежы (н. 1.11.1908, Варшава), польскі географ, даследчык геаморфалогіі і гідраграфіі Браслаўскага Паазер'я на Беларусі. Праф. Варшаўскага ун-та з 1954, старшыня Геагр. т-ва Польшчы з 1959. Працы па фіз. геаграфіі Польшчы.

Тв.: Studia nad morfologią i hydrografią Pojezierza Brasławskiego, «Przegląd geograficzny», 1938, t. 17—1937.

КАНДРАЦЬЕЎ Аляксандр Іванавіч [9(21). 3.1899, в. Міхайлава Люцынскага пав. Віцебскай губ.— 21.7.1968], удзельнік грамадз. вайны, ген.-м. авіяцыі (1944). З рабочых. Чл. КПСС з 1930. Скончыў Ваен.-паветр. акадэмію (1934). У арміі з 1915, у Чырв. гвардыі з кастр. 1917, потым у Чырв. Арміі. У 1918—20 на Усх., Паўд. і Зах. франтах — пам. камандзіра батарэі. З 1934 выкладчык Ваен.-паветр. акадэміі. У Айч. вайну на Каліпінскім і Прыбалт. франтах — нам. нач. штаба паветр. арміі. З 1945 у ваен. акрузе, з 1955 у адстаўцы. Узнаг. ордэнам Леніна, 6 інш. ордэнамі, медалямі.

КАНДРАЦЬЕЎ Віктар Мікалаевіч [п. 19.1 (1.2).1902, г. Рыбінск Яраслаўскай губ.], савецкі фізіка-хімік. Акад. АН СССР (1953, чл.-кар. 1943). Чл. КПСС з 1948. Скончыў Ленінградскі політэхн. ін-т (1924), працаваў у Фізіка-тэхн. ін-це АН СССР. З 1931 у Ін-це хім. фізікі АН СССР: нам. дырэктара (з 1948), заг. лабараторыі элементарных працэсаў (з 1940), заг. аддзела кінетыкі і гарэння (з 1944). Навук. працы па малекулярнай спектраскапіі, фотахіміі, будове рэчыва і хім. кінетыцы. Дзярж. прэмія СССР 1944. Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі.



Літ.: Виктор Николаевич Кондратьев. М., 1964 (Материалы к биобиблиографии ученых СССР).

КАНДРАЦЬЕЎ Іван Дзмітрыевіч [29.8(11.9). 1917, в. Гаршкова Горацкага пав. Магілёўскай губ.— 8.7.1958], Герой Сав. Саюза (1944). З сялян. Чл. КПСС з 1943. У Чырв. Арміі з 1941, на фронце з ліп. 1942 — камандзір разліку станковага кулямёта. Вызначыўся пры фарсіраванні Буга і Прута. 15 і 26.3. 1944 знішчыў 5 варожых агнявых кропак, гэтым



забяспечыў пераправу падраздзяленняў. Пасля вайны на сав. рабоце. Яго імя прысвоена Засценкаўскай школе Дубровенскага р-на Віцебскай вобл.

КАНДРАЦЬЕЎ Пётр Васілевіч [7(20).6. 1909, Віцебск — чэрв. 1943], Герой Сав. Саюза (1940). З сям'і чыгуначніка. Скончыў ваенна-марскую авіяц. школу (1933). Удзельнік сав.-фінляндскай вайны 1939—40. Зрабіў 66 баявых вылетаў, затапіў варожае судна з боепрыпасамі, пашкодзіў 2 параводы, знішчыў 6 аўтамашын, падпаліў на аэрадроме 7 самалётаў. У Айч. вайну абараняў Ленінград. Лётчыкі палка, якім камандаваў К., за 5 месяцаў зрабілі каля 5 тыс. баявых вылетаў, правялі 389 паветр. баёў, знішчылі 105 варожых самалётаў, 55 танкаў. Загінуў у баі. Яго імем названы былі населены пункт Сяклярва Карэльскай АССР.



КАНДРАШОЎ Пётр Пятровіч (н. 28.2.1924, в. Дзямідавічы Клімавіцкага пав. Гомельскай губ.), гасп. дзеяч, Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1955. Удзельнік Айч. вайны. У 1952—58 гал. аграном, дырэктар 2-й Міёрскай МТС, з 1959 старшыня калгаса «Маладая гвардыя» Міёрскага р-на Віцебскай вобл. Узнагароджаны ордэнам Леніна, ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі, 3 іншымі ордэнамі, медалямі.

КАНДУКТАР (англ. conductor ад лац. conduco перавожу), 1) на чыгуначным і гарадскім транспарце — работнік, які суправаджае цягнік, трамвай, тралейбус, аўтобус і абслугоўвае пасажыраў. 2) У машынабудаванні — прыстасаванне да свідравальнага станка, якое забяспечвае дакладны кірунак свердла і пэўнае ўзаемаразмяшчэнне свердла і дэталі, што апрацоўваецца. Характэрная дэталь К.— кандуктарныя ўтулкі, якія накіроўваюць рэальны інструмент пры рабоце. 3) У будаўніцтве — мантажнае прыстасаванне для часовага замацавання і выверкі зборных канструкцый.

КАНДЫДАМІКОЗЫ (к а н д ы д о з), хваробы, якія выклікаюцца дрожджападобнымі грыбкамі роду Candida. Развіваюцца пры актывізацыі грыбкоў у хворага ад нерацыянальнага ўжывання антыбіётыкаў (эндагеннае заражэнне), радзей пры перадачы грыбкоў ад хворага здаровому (экзагеннае заражэнне).

Адрозніваюць К.: слізістых абалонак (напр., малочніца), скуры (пухірковыя высыпкі, эрозіі), унутр. органаў (бранхіты, пнеўманія, піэланефрыты, эндакардыты, сепсіс). Лячэнне пры К. унутраных органаў: антыбіётыкі (ністацін, леварын), вітаміны, пераліванне крыві, уратрапін, вакцына, антыфаг; пры К. слізістых абалонак і скуры — тое ж і дадаткова фуксінавая сумесь Кастэлані, растворы Люголя, борная к-та. Прафілактыка: гігіена скуры і слізістых абалонак, ізаляцыя хворых, дэзінфекцыя іх рэчаў, рацыянальнае ўжыванне антыбіётыкаў.

Літ.: Кашкин П. Н. Материалы о клинике кандидозов, Л., 1968; Ариевич А. М. и Степанищева З. Г. Кандидамикозы и другие микозы как осложнение антибиотикотерапии, М., 1965 (бібліягр.). *А. І. Гурская.* Мінск.

КАНДЫДАТ, сталовы сорт бульбы, выведзены ў Бел. НДІ садоўніцтва, агародніцтва і бульбы скрыжаваннем сартоў Аквіла і Сеянец 9170. Познеспелы, ураджайны. Раянаваны ў БССР (1966). Прыгодны на выраб чыпсаў і крэкераў.

Смакавыя якасці і ўлежнасць добрыя. Крухмалістасць 15,9—20%. Клубні важаць 93—154 *г*, круглавата-авальныя, з невял. вочкамі. Мякаць белая, добра разварваецца, не цямнее пры рэзанні. Сорт ракаўстойлівы. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Бульба.*

Літ.: Каталог районированных сортов сельскохозяйственных культур по Белорусской ССР, Мн., 1968.

КАНДЫДАТ НАВУК, вучоная ступень у СССР. Прысуджаецца асобам, якія маюць вышэйшую адукацыю, здалі кандыдацкія экзамены і публічна абаранілі кандыдацкую *дысертацыю.*

У дысертацыі на атрыманне вучонай ступені К. н. павінны быць новыя навук. і практ. вывады і рэкамендацыі. Дысертант павінен выявіць здольнасць да самастойных навук. даследаванняў, глыбокія тэарэт. веды ў галіне выбранай ім спецыяльнасці. Замест дысертацыі абараняць можна падручнік, напісаны без сааўтарства, або надрук. працы, вынаходствы, адкрыцці, завершаныя работы па стварэнні новых машын, сістэм кіравання, прылад, збудаванняў і тэхнал. працэсаў, выкананыя індывідуальна і калектыўна. Ступень К. н. прысвойваюць саветы ВНУ і НДІ, якім *Вышэйшая атэстацыйная камісія* (ВАК) пры Мін-ве вышэйшай і сярэдняй спец. адукацыі СССР дае права прымаць да абароны кандыдацкія дысертацыі. ВАК кантралюе абароненыя ў саветах на атрыманне вуч. ступені К. н. дысертацыі (працы, падручнікі). Вуч. ступень К. н. прысвойваецца па навуках: фізіка-матэматычных, хімічных, біялагічных, геолага-мінералагічных, тэхнічных, сельскагаспадарчых, гістарычных, эканамічных, філасофскіх, філалагічных, геаграфічных, юрыдычных, педагагічных, псіхалагічных, медыцынскіх, фармацэўтычных, ветэрынарных, ваенных, ваенна-марскіх, мастацтвазнаўстве, архітэктуры. У нар. гасп. БССР у 1970 працавала каля 5,6 тыс. К. н. У замежных краінах вуч. ступені К. н. няма. *І. І. Леановіч.* Мінск.

КАНДЫДАТ У ЧЛЕНЫ КПСС, асоба, якая хоча ўступіць у члены Камуніст. партыі і праходзіць выпрабавальны тэрмін (кандыдацкі стаж), устаноўлены *Статутам КПСС.*

Парадак прыёму ў партыю з кандыдатаў, уведзены VIII Усерас. канфер. РКП(б) (1919), абавязваў, каб кожны, хто ўступае ў партыю, больш грунтоўна азнаёміўся з праграмай і статутам партыі, а парт. арг-цыя праверыла асабістыя якасці кандыдата. Паводле статута, прынятага VIII Усерас. канфер. РКП(б), той, хто ўступаў у канд., павінен быў мець 2 рэкамендацыі чл. партыі з 6-месячным стажам. Канд. стаж для рабочых і сялян вызначаўся не менш як 2 месяцы, для астатніх — не менш як 6 месяцаў. XII Усерас. канфер. РКП(б) (1922) устанавіла пры ўступленні ў канд. і чл. партыі тры катэгорыі: 1) рабочыя і чырвонаармейцы з рабочых і сялян, 2) сяляне (акрамя чырвонаармейцаў) і саматужнікі, якія не эксплуатуюць чужой працы, 3) іншыя (служачыя і г. д.). Асобы 1-й і 2-й катэгорый пры ўступленні ў партыю падавалі рэкамендацыі 3 чл. партыі з 3-гадовым стажам; асобы 3-й катэгорыі — рэкамендацыі 5 чл. партыі з 5-гадовым стажам. Канд. стаж для асоб 1-й катэгорыі — 6 месяцаў, 2-й — год, 3-й — 2 гады. У выніку карэнных змен у класавай структуры нашага грамадства XVIII з'езд ВКП(б) (1939) адмяніў катэгорыі пры прыёме ў канд. і чл. КПСС і ўстанавіў адзіныя ўмовы для рабочых, сялян і інтэлігенцыі. Гэтыя ўмовы захаваны і ў Статуце, прынятым XXII і часткова зменены на XXIII і XXIV з'ездах КПСС. Канд. у чл. КПСС удзельнічае ў рабоце парт.

арг-цыі, на парт. сходах карыстаецца дарадчым голасам, плаціць узносы, як і чл. партыі, аднак не можа быць выбраны ў кіруючыя парт. органы, на парт. канферэнцыі і з'езды. *С. Л. Саламаха.* Мінск.

КАНДЫТАРСКАЯ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ, галіна харчовай прамысловасці па выпуску кандытарскіх вырабаў: цукрыстых (карамелі, цукерак, дражэ, шакаладу, халвы, мармеладу, пасцілы) і мучных (пячэння, бісквітаў, пернікаў, вафляў, тартоў і інш.). Сыравіна: цукар, патака, мёд, садавіна, ягады, какава, арэхі, харч. тлушчы, малако, мука, араматычныя рэчывы і інш.

Да Кастр. рэвалюцыі на Беларусі былі дробныя прадпрыемствы К. п. ў Мінску, Гомелі, Магілёве і інш. гарадах, Нараўлянская кандытарская ф-ка (пабудавана ў 1913). На Беларусі ў 1913 выпушчана 360 *т* кандытарскіх вырабаў (карамель, ледзянцовыя «пеўнікі», яркаафарбаваныя пернікі). Пасля грамадз. вайны створаны каап. кандытарскія аб'яднанні. У 1927 у БССР было 37 дробных прадпрыемстваў К. п. Пазней на базе рэканструяваных прадпрыемстваў створаны Гомельскі кандытарскі камбінат «Спартак», Бабруйская мармеладная ф-ка «Чырвоны харчавік», Мінская бісквітная ф-ка, пабудавана Мінская кандытарская ф-ка «Камунарка». У 1932 валавая прадукцыя К. п. БССР склала 3,9%, у 1937 — 5,7% агульнасаюзнай вытворчасці. У Вял. Айч. вайну большасць кандытарскіх прадпрыемстваў БССР разбурана. Пасля вайны адноўлены, аснашчаны сучасным абсталяваннем, пабудаваны новыя цэхі. На індустр. аснове хутка павялічваецца вытворчасць кандытарскіх вырабаў (гл. табл.). У 1971 К. п. БССР выпусціла 550 назваў вырабаў, 25 з іх прысвоены дзяржаўны знак якасці. Гатункі цукерак «Беларуская бульба», «Камунарка», «Спартак» і інш. ўвайшлі ў саюзныя уніфікаваныя зборнікі рэцэптур. Прадукцыя К. п. БССР экспартуецца ў ГДР, Польшчу, Венгрыю; экспанавалася на кірмашах у Лейпцызе і Плоўдзіве. У СССР (1970) аб'ём вытворчасці кандытарскіх вырабаў склаў 2 млн. 808 тыс. *т*, асартымент — больш як 800 назваў. У сацыяліст. краінах К. п. найб. развіта ў Чэхаславакіі, сярод капіталіст. краін у ЗША, Вялікабрытаніі, ФРГ, Францыі і Італіі. Іл. гл. на ўкл.

Паказчыкі развіцця кандытарскай прамысловасці БССР

	1940	1950	1960	1970
Вытворчасць кандытарскіх вырабаў, тыс. *т*	41,2	47,0	70,7	119,0
Рэалізацыя кандытарскіх вырабаў, тыс. *т*				
у рэспубліцы	25,3	27,2	41,5	87,7
за межамі рэспублікі	15,9	19,8	29,2	31,3
Вытворчасць кандытарскіх вырабаў на душу насельніцтва, *кг*	4,5	6,1	8,6	13,2
Спажыванне кандытарскіх вырабаў на душу насельніцтва, *кг*	2,8	3,5	5,1	9,7

Літ.: Григорьев Ф. Б. и Фришман Д. И. Кондитерская промышленность СССР. М., 1961; Справочник кондитера, ч. 1—2, М., 1966—70.

В. А. Сысоева. Мінск.

КАНДЫЦЫІ НАСЕННЯ, паказчыкі якасці насення. У СССР прыняты спец. дзярж. агульнасаюзныя стандарты пасяўных якасцей насення с.-г. культур. К. н. залежаць ад чысціні і ўсходжасці, энергіі прарастання, вільготнасці, абсалютнай масы, адходаў, ад ступені пашкоджанасці хваробамі і шкоднікамі і інш. Паводле гэтых паказчыкаў насенне падзяляецца на I, II і III класы. У калгасах яно павінна адпавядаць I ці II класу. Якасць насення вызначаюць дзярж. насенныя інспекцыі.

Літ.: Растениеводство, 3 изд., М., 1971.

КАНДЫЦЫІ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ЖЫВЁЛЫ, стан укормленасці жывёлы, абумоўлены яе кармленнем, доглядам і характарам выкарыстання.

Адрозніваюць 4 асн. кандыцыі: племянную, ці заводскую (добрая ўкормленасць), рабочую (сярэдняя ўкормленасць), адкормачную (таўстая ўкормленасць), выставачную (укормленасць вышэй за сярэднюю). К. с. ж. вменьваюцца на працягу жыцця і нават аднаго года. Тып канстытуцыі і экстэр'ер жывёлы вызначаюць у племянной або ў рабочай кандыцыі.

Літ.: Борисенко Е. Я. Разведение сельскохозяйственных животных, 4 изд., М., 1967.

КАНДЫЦЫЯВАННЕ ПАВЕТРА (ад лац. conditio умова, стан), падтрымліванне ў памяшканнях паветранага асяроддзя з зададзенымі тэмпературай, вільготнасцю, ціскам, скорасцю руху, чысцінёй. К. п. ўключае таксама выдаленне пахаў (дэзадарацыя), падачу спрыяльных пахаў (адарацыя), рэгуляванне іоннага саставу (іанізацыя) і бактэрыял. ачыстку. Робіцца для паляпшэння ўмоў працы, забеспячэння тэхнал. працэсаў і інш.

Сістэмы К. п.: цэнтральныя (абслугоўваюць некалькі памяшканняў), мясцовыя (адно памяшканне або частку яго) і камбінаваныя; поўнага кандыцыявання (падтрымліваюць усе параметры) і частковага; круглагадавога і сезоннага дзеяння; нізкага (да 1 *кн/м²*), сярэдняга (1—2 *кн/м²*) і высокага (2—3 *кн/м²*) ціску. Апараты для К. п. — *кандыцыянеры.* К. п. шырока выкарыстоўваецца ў дакладным прыладабудаванні, электронна-вакуумнай, аптычнай, хім., тэкстыльнай, харч. і інш. прамысловасці, а таксама на тэлецэнтрах, кіна-караблях, у тэатрах і інш. грамадскіх і жылых будынках. Сістэмы К. п. ўстаноўлены на Мінскім тонкасуконным і камвольным камбінатах, газіпікавым з-дзе, у Палацы спорту і інш.

Літ.: Кондиционирование воздуха. Сб., М, 1963; Нестеренко А. В. Основы термодинамических расчетов вентиляции и кондиционирования воздуха, 3 изд., М., 1971; Справочник по теплоснабжению и вентиляции, кн. 2, 3 изд., Киев. 1968.

Ю. А. Фінаеў. Мінск.

КАНДЫЦЫЯНЕР, 1) апарат для *кандыцыявання паветра.* Адрозніваюць цэнтральныя К. — для вялікіх прамысл. і грамадскіх памяшканняў (прадукцыйнасць звыш 10 тыс. *м³* паветра ў *гадз*) і мясцовыя — для невялікіх памяшканняў (прадукцыйнасць да 10 тыс. *м³/гадз*). Складаюцца (гл. рыс.) з прылад для ачысткі, увільгатнення (асушэння), награвання (ахалоджвання) паветра і інш. 2) Апарат для цеплавой апрацоўкі збожжа ў мукамольнай вытворчасці. Збожжа ў К. награецца гарачым паветрам, каб лягчэй адзялялася абалонка і павышалася якасць мукі.



Прынцыповая схема кандыцыянера: *1* — вентылятар для падачы кандыцыянаванага паветра; *2* — каларыферы для падагравання паветра; *3* — увільгатняльная камера; *4* — паветраны фільтр; *5* — канал знадворнага паветра; *6* — сістэма ачысткі і падагравання вады.

КАНДЭНСАР (лям. Kondensor ад лац. condenso згушчаю), аптычнае прыстасаванне для раўнамернага асвятлення празрыстага поля (напр., дыяпазітыва, мікраскапічнага прэпарата). Нead'емная частка праекцыйных апаратаў, мікраскопаў, фатаграфічных павелічальнікаў і інш. Звычайна К. — збіральная лінза ці сістэма лінзаў (лінзавы К.), увагнутае люстэрка (люстэркавы К.) ці спалучэнне люстэрка і лінзы.

КАНДЭНСАТАР (у цеплатэхніцы), цеплаабменны апарат для ператварэння ў вадкасць (кандэнсацыі) пары якога-н. рэчыва ахалоджваннем пры зададзеным ціску.



Паверхневы кандэнсатар.

Выкарыстоўваецца ў паратурбінных установах для кандэнсацыі адпрацаванай вадзяной пары і ў халадзільных установах для кандэнсацыі пары халадзільных агентаў (фрэону, аміяку). У турбінах К. выконвае дзве функцыі: адводзіць у воднакавае асяроддзе нявыкарыстаную энергію згарэлага паліва і падтрымлівае ціск па-за турбінай на нізкім узроўні. Асн. тыпы К. — паверхневы і змешвальны. У паверхневых (гл. рыс.) пара кандэнсуецца ад сутыкнення з паверхняй халодных трубак, па якіх цыркулюе ахаладжальная вада. У такіх К. кандэнсат не забруджваецца ахаладжальнай вадой, таму яны шырока ўжываюцца на цеплавых электрастанцыях. Радзей сустракаюцца змешвальныя К., якія змешваюць пару з ахаладжальнай вадой.

Літ.: Вспомогательное оборудование тепловых электростанций, М., 1968.

Г. І. Хучкі. Мінск.

КАНДЭНСАТАР ЭЛЕКТРЫЧНЫ, прылада з металічных электраправодных лістоў (абкладак), падзеленых тонкімі слаямі ізаляцыйнага матэрыялу (дыэлектрыка), здольная назапашваць эл. энергію. Ужываецца ў радыё-, электратэхніцы і інш. як ёмістасць [гл. *Ёмістасць* (у першым значэнні)].



Тыпы кандэнсатараў: *а* — папярова-масляны; *б* — газанапоўнены; *в* — электралітычны; *г* — паветраны; *д* — керамічны; *е* — слюдзяны.

Ёмістасць К. э. расце з павелічэннем паверхні абкладак, з памяншэннем адлегласці паміж імі і прама прапарцыянальная *дыэлектрычнай пранікальнасці* дыэлектрыка. К. э. бываюць (гл. рыс.) пастаяннай і пераменнай ёмістасці, адрозніваюцца тыпам дыэлектрыка, формай абкладак, велічынёй ёмістасці, рабочым напружаннем. Паводле тыпу дыэлектрыка адрозніваюць К. э.: з газападобным дыэлектрыкам — паветраныя, газанапоўненыя, вакуумныя; з цвёрдым неарганічным дыэлектрыкам — слюдзяныя, шкляныя, керамічныя; электралітычныя (дыэлектрык — тонкі слой аксіду металу), сегнетаэлектрычныя, з вадкім дыэлектрыкам, папяровыя, плёнкавыя (поліцірольныя, тэфлонавыя) і інш. Асноўны від абкладак — металічная фольга (з алюмінію, серабра, цынку і інш.).

Літ.: Кузнецов М. И. Основы электротехники, 10 изд., М., 1970.

Г. І. Хучкі. Мінск.

КАНЕКТЫКУТ (Connecticut), штат на ПнУ ЗША, прылягае да праліва Лонг-Айленд. Пл. 12,9 тыс. км². Нас. 3 млн. чал. (1970). Адм. ц. Хартфард. Найб. гарады: Хартфард, Брыджпарт, Уотэрберы, Нью-Хейвен. Паверхня — прыбярэжная нізіна са спадзістымі адгор'ямі Апалачаў (выш. 200—400 *м* над узр. м.). Глебы бурыя лясныя ападзоленыя. Клімат умераны. Адзін з найб. развітых прамысл. штатаў ЗША. Авіяцыйна-ракетная; эл.-тэхн., электронная, аптычная, ваен., металаапр., машына-, станка-, прылада- і суднабудаўнічая, гумавая, хім. прамысловасць. С. гасп. прыгараднага характару. Пераважае малочная жывёлагадоўля і птушкагадоўля. Вырошчваюць тытунь. Рыбалоўства. Транспарт чыгуначны і аўтамабільны. Суднаходства па р. Канектыкут.

КАНЕЎСКАЯ СВІТА, адклады раннеэацэнавай эпохі *палеагенавага перыяду.* Пашыраны на Украіне, Паволжы, на ПдУ Беларусі (у Прыпяцкай упадзіне). На тэр. БССР прадстаўлены марскімі ўтварэннямі — шэра-зялёнымі дробнаазярністымі добраадсартаванымі глаўканітава-кварцавымі пяскамі з жаўлакамі пясчанікаў. Магутнасць 10—15 *м.* Узрост адкладаў вызначаны паводле спораў і пылку.

КАНЕЧНАЕ, катэгорыя матэматыкі, філасофіі, фізікі і логікі. Гл. *Бесканечнае і канечнае.*

КАНЕЧНЫ АЎТАМАТ, дэтэрмінаваны аўтамат з канечным лікам уваходных сігналаў, выхадных сігналаў і ўнутраных станаў.

Аснова тэорыі К. а.— тэарэма, якая характарызуе падзеі, прадстаўленыя ў К. а., і тэарэма аб працягласці эксперыменту для адрознення двух К. а. Пытанні сінтэзу канечных аўтаматаў маюць розныя дастасаванні і складаюць тэарэтычную аснову метадаў праектавання дыскрэтных прыстасаванняў, у т. л. і вылічальных машын. Гл. таксама *Аўтаматаў тэорыя, Дэтэрмінаваныя і імавернасныя аўтаматы.*

КАНЕЧНЫХ РОЗНАСЦЕЙ ВЫЛІЧЭННЕ, раздзел матэматыкі, у якім вывучаюцца функцыі пры дыскрэтных значэннях аргументаў. Спец. выразы, што звязваюць значэнні функцыі ў розных пунктах, наз. канечнымі рознасцямі (КР). Выкарыстоўваюцца КР пры прыбліжаным рашэнні дыферэнцыяльных ураўн., інтэрпаляванні, лікавым дыферэнцы-

раванні і інтэграванні, у інш. раздзелах матэматыкі. Гл. таксама *Прыбліжанае інтэграванне, Прыбліжэнне і інтэрпаляванне функцыі.*

КР першага парадку для функцыі $y=f(x)$ у пункце x вызначаецца па адной з наст. формул: $\Delta y(x)=y(x+h)-y(x)$, $\nabla y(x)=y(x)-y(x-h)$, $\delta y(x)=y\left(x+\frac{h}{2}\right)-y\left(x-\frac{h}{2}\right)$, дзе h — фіксаваная велічыня прырашчэння аргумента. Калі вядомым КР першага парадку, можна знайсці рознасці больш вышэйшых парадкаў у зададзеным пункце x паслядоўна па формулах: $\Delta^2 y(x)=\Delta y(x+h)-\Delta y(x)$, ..., $\Delta^n y(x)=\Delta^{n-1}y(x+h)-\Delta^{n-1}y(x)$, дзе n — парадак рознасці. Паміж К. р. в. і дыферэнцыяльным і інтэгральным вылічэннямі існуе аналогія, якая выяўляецца, у прыватнасці, пры даследаванні ўраўн. у канечных рознасцях. Напр., лінейнае рознаснае ўраўн. рашаецца аналагічна, як і лінейнае дыферэнцыяльнае ўраўненне.

Літ.: Гельфонд А. О. Исчисление конечных разностей. 3 изд., М., 1967. *Л. А. Яновіч.* Мінск.

КАНЕНКАЎ Сяргей Цімафеевіч [28.6(10.7). 1874, в. Каракевічы Ельнінскага пав. Смаленскай губ.—9.10.1971], рускі савецкі скульптар. Нар. мастак СССР (1958). Правадз. чл. АМ СССР (з 1954). Герой Сац. Працы (1964). Вучыўся ў Маск. вучылішчы жывапісу, ваяння і дойлідства (1892—96) у С. Іванава і С. Валнухіна, у Пецярбургскай АМ (1899—1902). Удзельнік рэвалюцыі 1905—07 у Расіі. Член «Саюза рускіх мастакоў» (старшыня ў 1918—23) і аб'яднання «Свет мастацтва». У 1924—45 жыў у ЗША, з 1945 у Маскве. Удзельнічаў у рэалізацыі ленінскага плана манументальнай прапаганды. Працаваў над афармленнем Усерасійскай сельскагаспадарчай і саматужна-прамысловай выстаўкі у Маскве (1923). Партрэтыст, майстар манумент. і дэкар. скульптуры. У 1898 К. выступіў з рэаліст. скульптурай «Каменябоец». Стварыў партрэты («Ніке», «Паганіні», «Рабочы-баявік 1905 года І. Чуркін» — усе 1906; А. М. Горкага, 1928; І. П. Паўлава, 1930; Ф. М. Дастаеўскага, 1933; Н. Белаяніса, 1951; Ф. І. Шаляпіна, 1952; В. Ф. Купрэвіча, 1967; «Аўтапартрэт», 1954, Ленінская прэмія 1957), манументальныя кампазіцыі («Загінуўшым у барацьбе за мір і братэрства народаў», 1918; «Вызвалены чалавек», 1947), жаночыя фігуры і торсы, казачныя і міфалагічныя вобразы («Дзядок-палявічок», 1910, і інш.). У Дзярж. маст. музеі БССР «Красуня ў какошніку» (1911), «Вешчая бабулька» (1916), «Дзяўчына ў вянку» (1917), у Брэсцкім інж.-буд. ін-це перададзены К. скульптурны партрэт У. І. Леніна (1969). Дзярж. прэмія СССР 1951. Узнагароджаны 2 ордэнамі Леніна. Ілюстр. гл. таксама на ўкл. да арт. *Аўтапартрэт.*





С. Ц. Канёнкаў. Вешчая бабулька. 1916. Дзярж. маст. музей БССР.

Літ. тв.: Слово к молодым. М., 1958; Мой век. М., 1971.

Літ.: Каменский А. Коненков. М., 1962; Кравченко К., С. Т. Коненков. М., 1967; Белогорцев И. Д. Старейший русский ваятель. «Смоленский альманах», 1953, № 12.

І. Дз. Белагорцаў. Брэст.

КАНЗАС (Kansas), штат у цэнтр. ч. ЗША. Пл. 213,1 тыс. км². Нас. 2,2 млн. чал. (1970). Адм. ц. Тапіка. Найб. гарады: Тапіка, Уічыта. Паверхня — хвалістая раўніна выш. 300—600 м над узр. м., на З пераходзіць у плато прэрый выш. 1200 м. Глебы пераважна чарназёмныя, на З каштанавыя. Клімат умераны, кантынентальны. Найб. рэкі: Місуры, Арканзас, Канзас. Авіяц., мукамольная і харч. прамысловасць; транспартнае і агульнае машынабудаванне (у т. л. вытв. с.-г. машын і абсталявання для апрацоўчай прамысловасці); нафтаперапр. з-ды. Здабыча нафты, прыроднага газу, цынку, свінцу. Вырошчваюць пшаніцу (1-е месца ў ЗША па зборы), сорга, кукурузу, авёс, ячмень, цукр. буракі, бульбу, люцэрну. Жывёлагадоўля мясная кірунку. Транспарт чыг. і аўтамабільны.

КАНІБАЛІЗМ (іспан. canibal людаед), гл. *Людаедства.*

КАНІН ПАЎВОСТРАЎ, на Пн Еўрап. часткі РСФСР. Аддзяляе Белае м. ад Чэшскай губы Баранцавага м. Пл. каля 10 500 км². Паверхня раўнінная, забалочаная. На Пн платопадобны краж Канін Камень (выш. 242 м), складзены з крышталічных сланцаў. Расліннасць тундравая. Рыбалоўства і марскі промысел, аленегадоўля і паляванне. Насельніцтва — рускія і ненцы.

КАНІСКІ Георгій (20.11.1717, Нежын — 13.2.1795), украінскі і беларускі пісьменнік, царкоўна-паліт. і культурны дзеяч. Вучань Ф. Пракаповіча і настаўнік Г. Скавароды. Скончыў Кіеўскую духоўную акадэмію (1743). З 1745 праф. філасофіі і пітыкі, з 1751 рэктар гэтай акадэміі. З 1755 бел. праваслаўны архіепіскап у Магілёве. Вызначыўся як выдатны аратар і заўзяты змагар супраць Ватыкана і *Брэсцкай уніі 1596.* Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай прыклаў шмат намаганняў, каб вярнуць уніятаў у праваслаўе. Імкнуўся да пашырэння асветы на Беларусі. У некат. пытаннях адыходзіў ад тэалогіі да навукі, высока ставіў вучэнні Капернікa, Галілея, Дэкарта. Паважаў розум чалавека. У этыцы К. сустракаюцца элементы народнага светапогляду, напр. «шчасця чалавек павінен шукаць у гэтым жыцці». Аўтар курсаў пітыкі («Правілы паэтычнага мастацтва») і філасофіі (на лац. мове), гістар. запісак пра Магілёўскую епархію, інтэрмедый, віршаў, казанняў, прамоў. У трагікамедыі «Уваскрэсенне мёртвых...» (1747) з пазіцый артадаксальнай праваслаўнай царквы трактуе востру сац. тэму эксплуатацыі працоўных. А. С. Пушкін высока ацэньваў дзейнасць К.

Літ.: Павлович М. Георгий Конисский, архиепископ могилевский, «Христианское чтение», 1873, ч. 1; Коялович М. Деятельность Георгия Конисского после первого раздела Польши, там жа; Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии, Мн., 1962; Історія української літератури, т. 1, Київ, 1967.

А. Ф. Коршунаў, Э. К. Дарашэвіч. Мінск.

КАНІФОЛЬ (ад лац. Colophonia resina каласанійская смала), гарпіус, цвёрдая фракцыя, якая астаецца ад смол *(бальзамаў, жывіцы)* хвойных дрэў пасля адгонкі лятучых злучэнняў.

Шклопадобнае крохкае рэчыва ад светла-жоўтага да цёмна-чырвонага колеру. Паводле хім. саставу — сплаў смаляных кіслот ($C_{19}H_{29}COOH$). Растварэцца ў ацэтоне, спірце, шкіпінары, бензіне; з асновамі ўтварае солі. Ужываецца для праклейкі паперы, у мылаварэнні, у эл.-тэхн. прамысловасці, у вытв. лакаў, лінолеуму, сургучу, замазак.

КАНІЧНЫЯ СЯЧЭННІ, лініі, якія атрымліваюцца пры перасячэнні прамога кругавога *конуса* з плоскасцямі, што не праходзяць праз яго вяршыню. Пры розных становішчах сякучай плоскасці адносна конуса атрымлів а ю ц ц а *эліпс* (рыс. *а*), *парабала* (рыс. *б*), *гіпербала* (рыс. *в*).



Калі ў плоскасці выбрана дэкартава сістэма каардынат, то кожнае з К. с. вызначаецца ўраўн. 2-й ступені: $Ax^2+2Bxy+Cy^2+2Dx+2Ey+F=0$. Наадварот, калі такое ўраўн. мае хоць адно сапраўднае рашэнне і левая частка ўраўн. не распадаецца на два лінейныя множнікі, то гэтае ўраўн. задае адно з К. с. Такім чынам, К. с. вызначаюцца яшчэ як крывыя 2-га парадку, якія не распадаюцца. К. с. сустракаюцца ў з'явах прыроды і ў розных галінах навукі. Напр., планеты сонечнай сістэмы рухаюцца па эліпсах; траекторыі штучных спадарожнікаў Зямлі таксама эліпсы; траекторыя цела, кінутага нахілена да гарызонту, падобна на парабалу. Гіпербалай вызначаецца графік адваротнай прапарцыянальнай залежнасці.

Літ.: Ван дер Варден Б. Л. Пробуждающаяся наука, пер. с голл., М., 1959; гл. таксама літ. пры арт. *Аналітычная геаметрыя.*

А. С. Фядзенка. Мінск.

КАНІЧЫ, вёска ў Бялынкавіцкім с/с Касцюковіцкага р-на Магілёўскай вобл., на р. Беседзь. Цэнтр саўгаса «Канічы». За 13 км на Пд ад Касцюковіч, 164 км ад Магілёва, 3 км ад чыг. раз'езда Наваліпаўскі. 494 ж., двароў 187 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, швейная майстэрня, 2 магазіны. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

КАНКАРДАТ (позналац. concordatum пагадненне), дагавор паміж папам рымскім і ўрадам пэўнай дзяржавы аб становішчы і прывілеях каталіцкай царквы ў гэтай краіне. Юрыдычна замацоўвае саюз царквы і дзяржавы.

Адным з першых быў Вормскі К. (1122) паміж рымскім папам Каліктам II і імператарам «Свяшчэннай Рымскай імперыі» Генрыхам V, які закончыў барацьбу за інвеставуру. К. 1929 замацаваў згоду Ватыкана з урадам Мусаліні. К. 1933, аформіў саюз Ватыкана з фаш. Германіяй.

Літ.: Гл. пры арт. *Ватыкан, Папства.*

КАНКІСТАДОРЫ (іспан. conquistador заваёўнік), іспанскія заваёўнікі, якія захапілі ў 15—16 ст. значныя тэрыторыі Паўд., Цэнтр. і Паўн. Амерыкі. Пазней К. сталі называць інш. бязлітасных заваёўнікаў.

Літ.: Снегирев В. Конкистадоры, М., 1936.

КАНКРЭТНАЯ МУЗЫКА (франц. musique concrète), уяўна-музычныя кампазіцыі, заснаваныя на мантажы запісаных на магнітафонную стужку і на-рознаму ператвораных прыродных або штучных гучанняў. У К. м. выкарыстоўваюцца пераважна шумы, часткова гучанні, атрыманыя з дапамогаю электронных прылад (гл. *Электронная музыка*). Узнікненне К. м. выклікана агульным крызісам муз. мастацтва бурж. краін у час імперыялізму.

«Вынаходнік» К. м.— франц. інжынер-акустык П. Шэфер (яго першыя «канкрэтныя» творы напісаны ў 1948). Школы К. м. ўзніклі, акрамя Францыі, у Італіі, ФРГ, ЗША. Адмаўляючыся ад сістэмы гукавышыннай арганізацыі, прыхільнікі К. м. гранічна звужваюць магчымасці выяўлення маст. зместу. Пэўны маст. эфект часам дасягаецца пры выкарыстанні асобных гучанняў К. м. з ілюстрацыйнай мэтай (у тэатр., кінамузыцы і пад.).

Літ.: Шнеерсон Г. О музыке живой и мертвой, 2 изд., М., 1964; Ягожк. Французская музыка XX века, 2 изд., М., 1970.

КАНКРЭТНАЯ ПРАЦА, праца, якая затрачана ў пэўнай мэтазгоднай форме і стварае спажывецкую вартасць. К. п.— праца работніка пэўнай спецыяльнасці (шахцёра, сталявара і інш.). Процістаіць *абстрактнай працы.* Гл. таксама *Тавар.*

КАНКРЭЦЫЯ (лац. concretio зрастанне), сцягванне, мінеральнае ўтварэнне пераважна круглаватай формы ў асадкавых горных пародах.

Складзена з агрэгатаў аднародных ці розных мінералаў, якія адрозніваюцца ад умішчальнай пароды. Рост К. ідзе ад цэнтра да перыферыі, памеры ад некалькіх міліметраў да дзесяткаў сантыметраў і больш (гл. таксама *Сакрэцыя*). У выглядзе К. трапляюцца жалезныя і марганцавыя руды, фасфарыты.

КАНКУРЭНЦЫЯ (ад лац. concurro сутыкаюся), барацьба паміж прыватнымі вытворцамі за найбольш выгадныя ўмовы вытворчасці і збыту, паміж капіталістамі або аб'яднаннямі капіталістаў за атрыманне найвышэйшага прыбытку. Эканам. аснова К.— прыватная ўласнасць на сродкі вытворчасці пры наяўнасці таварна-грашовых адносін. Паскарае перарастанне простай таварнай вытворчасці ў капіталістычную, канцэнтрацыю і цэнтралізацыю капіталу, утварэнне сярэдняй нормы прыбытку, ператварэнне вартасці тавару ў цану вытворчасці (пры міжгаліновай К.); узнікненне рыначнай вартасці і рыначнай цаны тавару (пры ўнутрыгаліновай К.). Пры імперыялізме «канкурэнцыя... азначае нечувана зверскае падаўленне прадпрыймальнасці, энергіі, смелага пачыну мас насельніцтва, гіганцкай большасці яго, дзевяноста дзевяці сотых працоўных, азначае таксама

замену спаборніцтва фінансавым машэнніцтвам, дэспатызмам, прыслужніцтвам на версе сацыяльнай лесніцы» (Ленін У. І. Тв., т. 26, с. 367). У адрозненне ад К. даманапаліст. капіталізму, накіраванай на выцясненне канкурэнта, пры імперыялізме яна ставіць за мэту поўнае яго знішчэнне. Сацыялізм з уласцівай яму грамадскай уласнасцю на сродкі вытворчасці ліквідуе асновы К., спараджае форму масавага выяўлення ініцыятывы, творчасці працоўных — *сацыялістычнае спаборніцтва.*

Пры даманапаліст. капіталізме панавала свабодная К., якая прывяла да ўтварэння капіталістычных манаполій. *Манаполіі* не ліквідуюць К. і анархіі вытворчасці, а ўжываюць новыя формы, найб. жорсткія і бязлітасныя метады канкурэнтнай барацьбы: насілле (дэмпінг, байкот, пазбаўленне канкурэнта сыравіны, крэдыту), подкуп і шантаж, эканам. шпіянаж, дыверсіі і інш. Канкурэнтная барацьба адбываецца паміж манаполіямі, унутры манапаліст. аб'яднанняў, паміж манаполіямі і неманапалізаванымі прадпрыемствамі (аўтсайдэрамі). Манаполіям у канкурэнтнай барацьбе за прыбыткі памагае бурж. дзяржава (гл. *Дзяржаўна-манапалістычны капіталізм*). Каб забяспечыць збыт тавараў, расшырыць крыніцы сыравіны і сферы прыкладання капіталу, ствараюцца міждзяржаўныя манапаліст. аб'яднанні (гл. *Інтэграцыя эканамічная*).

Літ.: Маркс К. Капітал, т. 1, Мн., 1952, с. 542—543, 621—622, т. 3, Мн., 1953, с. 177—203, 849—872; Ленін У. І. Тв. [гл. Даведачны т., ч. 1 (Справочный т. к Полн. собр. соч., ч. 1)].

С. Я. Янчанка. Мінск.

КАНОН (ад грэч. kanón правіла, прадпісанне), 1) цвёрда вызначанае правіла, норма. 2) У выяўл. мастацтве — норма, якая прадугледжвае ў творах пэўнага перыяду або кірунку строга вызначаную кампазіцыю, сістэму прапорцый, іканаграфію і інш.; творы, якія з'яўляюцца нарматыўным узорам, асабліва ў іканапісе. 3) У музыцы — найб. строгая поліфанічная форма, дзе галасы ўступаюць адзін за адным па прынцыпе імітацыі, дакладна паўтараючы мелодыю першага голасу. У форме К. пішуцца самастойныя невялікія п'есы або эпізоды буйных твораў. 4) У тэалогіі — правіла, догмат, абрад, узведзены царквой у закон, рэліг. кніга.

КАНОПЛЕАПРАЦОЎЧЫЯ МАШЫНЫ, с.-г. ўстаноўкі і агрэгаты для атрымання валакна канаплянай трасты. Бываюць: мяльныя — ломяць і часткова аддзяляюць сухую кастрыцу ад сцяблоў канапель; трапальныя — ачышчаюць доўгае валакно ад кастрыцы і кароткіх валокнаў; трасільныя — аддзяляюць кудзелепадобнае валакно ад адходаў; камбінаваныя мяльна-трапальныя і кудзелепрыгатавальныя машыны і агрэгаты.

На пеньказаводах апрацоўка канаплянай трасты робіцца паслядоўна на мяльна-трапальных агрэгатах [складаюцца з мяльных машын ПМГ-1 ці ПМ-51 і трапальных ШПО-2 (ШПО-2М) ці ТДК-2], трасільных (ТГ-135Л) і кудзелепрыгатавальных машынах (КПП-2, КПП-3). У калгасах ужываюцца універсальная льноканоплемялка МЛКУ-6, пенькатрапальная машына ПТМ-1 (рыс. 1) і кудзелепрыгатавальнік КПК-100 (рыс. 2). Асн. частка мяльных машын — рыфленыя вальцы, якія, круцячыся, разбураюць драўніну і не пашкоджваюць валакна. На пенькатрапальных машынах кастрыца і кароткае валакно аддзяляюцца з дапамогай чатырохбільных барабанаў. Кудзелепрыгатавальнікі маюць тры асн. часткі: мяльную, трапальна-расчэсвальную і трасільную. Прадукцыйнасць мяльна-трапальных агрэгатаў пры выкарыстанні мялкі ПМГ-1 да 2,75 *т* трасты ў *гадз*; кудзелепрыгатавальнікаў КПП-2, КПП-3 да 2,5 *т* і КПК-100 да 0,14 *т* кароткага валакна ў *гадз*. На Беларусі пашырана заводская апрацоўка канаплянай трасты.

Рыс. 1. Пенькатрапальная машына ПТМ-1.





Рыс. 2. Кудзелепрыгатавальнік КПК-100.

Літ.: Марков В. В. Первичная обработка лубяных культур, 2 изд., М., 1969; Сельскохозяйственная техника. Каталог, 3 изд., М., 1967; Справочник по заводской первичной обработке конопли, кенафа и джута, 2 изд., М., 1960; Ярашэвіч А. А. і Бяспалаў М. М. Механізацыя ўборкі і апрацоўкі ільну і канапель, Мн., 1958.

А. П. Карабач. Мінск.

КАНОПЛЕЎБОРАЧНЫЯ МАШЫНЫ, с.-г. машыны для ўборкі і абмалоту канапель. Да іх адносяцца каноплежняяркі, каноплемалатарні і каноплеўборачныя камбайны.



Рыс. 1. Каноплеўборачны камбайн ККП-1,8.

Пры раздзельным спосабе ўборкі і малацьбы ўжываюцца каноплежняяркі і каноплемалатарні. Жняяркі (асн. тыпы ЖК-2,1А, ЖСК-2,1) зрэзваюць сцяблы і ачышчаюць іх ад пустазелля, збіраюць у асобныя порцыі і скідваюць на зямлю (ЖК-2,1А) або звязваюць у снапы і раскладваюць на полі (ЖСК-2,1). Асн. іх часткі — рэзальны апарат з механізмам падымання, травааддзяляльнік і апарат парцыённага скідвання (вязальны апарат). Абодва тыпы машын трактарныя прычапныя; прадукцыйнасць 1—1,5 *га/гадз* пры скорасці трактара 4,5—6 *км/гадз*. Каноплі і інш. лубяныя высокасцябловыя культуры (кенаф, джут) абмалочваюць малатарнямі МК-6А і МЛК-4,5. Найб. прадукцыйная МЛК-4,5, абмалочвае снапы і ачышчае насенне. Складаецца з малацільнага і цёрачнага апаратаў, скрабалкавага элеватара, веялкі-сарціроўкі і транспарцёраў. Апрацоўвае да 4,5 *т* снаповай масы за гадзіну. Каноплеўборачны камбайн ККП-1,8 (рыс. 1) — спалучэнне жняяркі і малатарні; сярэдняя прадукцыйнасць 0,8 *га/гадз*. Агрэгатуецца з трактарамі «Беларусь», Т-74, ДТ-75 і інш. На Беларусі найб. ужываецца жняярка ЖК-2,1А (рыс. 2).



Рыс. 2. Каноплежняярка ЖК-2,1А.

Літ.: Ярашэвіч А. А. і Бяспалаў М. М. Механізацыя ўборкі і апрацоўкі ільну і канапель, Мн., 1958; Сельскохозяйственная техника. Каталог, 3 изд., М., 1967.

А. А. Ярашэвіч. Мінск.

КАНОПЛІ (Cannabis), род аднагадовых травяністых раслін сям. каноплевых. Вядома 3 віды, пашыраныя ў Еўропе і Азіі. У СССР вырошчваюцца К. звычайныя (C. sativa) — валакністая і алейная расліна. Дае моцнае, устойлівае да гніення валакно, якое ідзе на выраб парусіны, брызенту, мешкавіны, рыбалоўных снасцяў, канатаў, вяровак, шпагату і інш. Насенне К. (30—35% алею) мае харч. і тэхн. значэнне. Канапляная макуха добры канцэнтраваны корм. З кастрыцы К. вырабляюць тэрмаізаляцыйныя пліты, паперу, пластмасу, цэлюлозу.

К. звычайныя — пераважна двухдомная, святло-, цепла- і вільгацелюбная расліна, патрабавальная да ўгнаенняў, асабліва арганічных. Сав. селекцыянерамі выведзены сорт К. Паўднёвавыспявальныя аднадомныя. На Беларусі К. добра растуць на тарфяных глебах (выш. да 5 *м*, таўшчыня сцябла 4—8 *мм*, у разрэджаных пасевах — 1 *см*). Могуць даваць ураджаі валакна 12—18 *ц/га*. Найлепшыя папярэднікі ў севазваротах — прапашныя, зернебабовыя, сіласныя, азімыя. Раянаваныя сарты: Паўднёвавыспявальныя 6 і Паўднёвавыспявальныя 1. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Тэхнічныя культуры.*

Літ.: Конопля, М., 1963; Лашкевич Г. И. Плодородие торфяных почв и возделывание конопли, Мн., 1962.

Р. І. Лашкевіч. Мінск.

КАНОПЛІЧ Павел Ігнатавіч [н. 30.1 (12.2). 1912, в. Замошша Мазырскага пав. Мінскай губ.], перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1963. Удзельнік партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. У 1935—37 калгаснік калгаса «Перамога» Лельчыцкага р-на, у 1937—68 трактарыст Лельчыцкай МТС, звеннявы механізаванага звяна па вырошчванні бульбы ў саўгасе «Лельчыцкі» Гомельскай вобл. Дэп. Вярх. Савета БССР 6-га скл. Жыве на радзіме.

Літ.: Правасуд У. Сяброўская падтрымка, у кн.: Сцяганосцы новага, перадавога, Мн., 1967.

КАНОСА (Canossa), замак у Паўн. Італіі, дзе ў студз. 1077 у барацьбе за *інвестытуру* папа рымскі Грыгорый VII сустрэўся з герм. каралём *Генрыхам IV*. Паводле хронік Генрых IV, якога папа адлучыў ад царквы і пазбавіў трона, прастаяў некалькі дзён каля сцен К., дамагаючыся аўдыенцыі папы, каб пакаяцца. «Ісці ў К.» — крылаты выраз, азначае згоду на ўніжальную капітуляцыю.

КАНОЭ (ісп. canoa човен), вёсельная спартыўна-прагулачная лодка. Гл. ў арт. *Лодкі.*

КАНПУР, горад на Пн Індыі, у штаце Утар-Прадэш, на р. Ганг. Вузел чыг. і аўтамаб. дарог. Аэрапорт. 1273 тыс. ж. (1971). Найб. пасля Калькуты прамысл. цэнтр паўн. Індыі. Шарсцяная, баваўняная, трыкатажная, шаўковая, гарбарна-абутковая, хім., харч. (у т. л. мукамольная, рысаачышчальная і алейная), маш.-буд., металаапр. прамысловасць. Рамесныя майстэрні. У прыгарадзе с.-г. коледж і доследная станцыя.

КАНСАЛІДАЦЫЯ ў геалогіі (ад лац. consolidatio умацаванне), пераўтварэнне вельмі рухомых геасінклінальных абласцей зямной кары ў больш трывалыя ў адносінах да тэктанічных дэфармацый участкі — платформы. Пры гэтым характэрны інтэнсіўная складкавасць і магматычная дзейнасць (гранітоідныя інтрузіі), павелічэнне таўшчыні і жорсткасці зямной кары. На тэр. Беларусі, якая з'яўляецца часткай Усх.-Еўрап. платформы, К. адбылася ў дакембрыйскі час.

КАНСАНАНС (франц. consonance ад лац. consono зладжана гучу), 1) у музыцы — спалучэнне двух або некалькіх гукаў, якое выклікае адчуванне зладжанасці, стройнасці гучання. К. проціпастаўляецца *дысанансу*, дыялектычныя ўзаемаадносіны паміж імі — крыніца гарманічнага развіцця. Сярод інтэрвалаў да К. належаць чыстыя актава, квінта, кварта (у традыц. тэорыі музыкі яны наз. дасканалымі К.), вял. і малыя тэрцыі і сексты (т. зв. недасканалыя К.), сярод акордаў — мажорнае і мінорнае трохгуччы і іх абярненні (толькі ў гэтых акордах кансануюць паміж сабою любыя два гукі). 2) У вершаскладанні — від рыфмы, у якой націскныя галосныя слоў, што рыфмуюцца, розныя, але паслянаціскны або пераднаціскны рад гукаў аднолькавы. Напр., «слава» — «слова», «разам» — «розум».

КАНСАНАНТЫЗМ, сістэма зычных гукаў якой-н. мовы. Гл. *Зычныя гукі.*

КАНСЕРВАВАННЕ ХАРЧОВЫХ ПРАДУКТАЎ (лац. conservo зберагаю), апрацоўка харчовых прадуктаў, каб засцерагчы іх ад псавання мікраарганізмамі. Пашыраныя спосабы К. х. п.: *стэрылізацыя, пастэрызацыя*, сушка, замарожванне, квашанне, *марынаванне*, саленне, *вэнджанне*, апрацоўка кансервантамі (гл. *Антысептычныя сродкі*) — заснаваны на знішчэнні або прыгнечанні жыццядзейнасці мікраарганізмаў і дзейнасці ферментаў.

Пры сушцы прадукты абязводжваюцца, што перашкаджае развіццю мікраарганізмаў. Сушаць плады, ягады, агародніну, рыбу, мяса, малако высокімі т-рамі, у кіпячым слаі, метадам сублімацыі і інш. Замарожванне (пры *t* ад −18 да −40 °С) выклікае частковую крышталізацыю вадкасці ў прадуктах, што прыгнятае жыццядзейнасць мікраарганізмаў. Замарожваннем кансервуюць садавіну, агародніну, харч. паўфабрыкаты. Для нядоўгага кансервавання прадукты ахалоджваюць. Пастэрызаваныя сокі трымаюць пры нізкіх плюсавых т-рах (2—1 °С) пад ціскам вуглекіслаты або ў асептычных умовах. Асептычнае кансерваванне найлепш зберагае пажыўную каштоўнасць прадуктаў — фруктовых, агароднінных пюрэ і сокаў. Квашанне, марынаванне, саленне заснаваны на бактэрыцыдным дзеянні арган. к-т. Кансерваваннем з дапамогай высокіх канцэнтрацый цукру гатуюць варэнне, джэм, павідла.

Літ.: Ильченко С. Г., Марх А. Т. и Фан-Юнг А. Ф. Технология консервирования и технохимический контроль, М., 1964; Хранение и переработка плодов, овощей и картофеля в домашних условиях, Мн., 1971; Генин С. А. Технология сушки картофеля, овощей и плодов, М., 1960; Крюсс В. В. Промышленная переработка плодов и овощей, пер. с англ., ч. 1—2, М., 1963.

І. Я. Аўруцкая, В. С. Скрыпнічэнка. Мінск.

КАНСЕ́РВАВАЯ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ, галіна харчовай прамысловасці па вырабе кансерваваных прадуктаў з сыравіны раслінага і жывёльнага паходжання. Выпускае агародніна-ныя, фруктовыя, грыбныя, мясныя, малочныя, рыбныя кансервы; агародніна-ныя і пладова-ягодныя сокі. Дае магчымасць раўнамерна забяспечваць насельніцтва на працягу года харч. прадуктамі сезоннага характару, захоўваць іх каштоўныя і смакавыя якасці. Сыравіна: агародніна, садавіна, ягады, грыбы, мяса, малако, рыба.

У БССР К. п. як індустр. галіна пачала развівацца пасля Вял. Айч. вайны. Выпуск кансерваў усіх відаў адпаведна склаў (млн. умоўных слоікаў): 1940 — 10,6; 1960 — 176,1; 1965 — 267,5; 1970 — 420,3. Вытворчасць кансерваў у сярэднім на 1 чал. ў год павялічылася з 1,2 умоўнага слоіка ў 1940 да 46,6 у 1970. К. п. рэспублікі ператварылася ў важную галіну харч. прамысловасці, расшырыўся асартымент яе прадукцыі (гл. табл.).

Структура вытворчасці кансерваў у БССР (у % да агульнага аб'ёму)

Віды кансерваў	1958	1960	1965	1970
Сокі і пладова-агародніныя кансервы	65,9	71,2	75,6	78,0
Малочныя	22,7	19,7	17,3	15,0
Мясныя	10,4	8,2	5,9	6,1
Рыбныя	1,0	0,9	1,2	0,9

Паніжэнне ўдз. в. малочных, мясных і рыбных кансерваў пры адначасовым павелічэнні аб'ёму іх выпуску выклікана хуткім ростам вытворчасці пладова-агародніных кансерваў. БССР выпускае амаль 4% усіх кансерваў у СССР і займае 4-е месца (1970) пасля РСФСР, УССР, Малдаўскай ССР. Пладова-агародніных кансерваў вырабляецца 4,3% (5-е месца), малочных 5,8, мясных 4,1, рыбных 2,7% агульнасаюзнай вытворчасці (1970). Найб. развіта вытворчасць пладова-агародніных кансерваў. У 1971 у БССР было 85 спецыялізаваных заводаў і буйных кансервавых цэхаў пры сушыльных з-дах і харч. камбінатах. Самыя буйныя з гэтых прадпрыемстваў: Быхаўскі, Ганцавіцкі кансервава-агародніна-сушыльны камбінаты, Мінскі пладовакансервавы камбінат Белкаапсаюза, Слуцкі, Кобрынскі, Глыбоцкі, Хойніцкі кансервавы з-ды і інш. Рыбныя кансервы выпускаюць 5 цэхаў пры рыбных з-дах: Віцебскім, Полацкім, Браслаўскім, Нарачанскім, Чырвонапалескім (на воз. Чырвонае), мясныя — на Аршанскім, Баранавіцкім мясакамбінатах, малочныя — на Рагачоўскім малочнакансервавым камбінаце. У 1971—75 намечана выпусціць кансерваў (млн. умоўных слоікаў): мясных 30, малочных 110,6, пладова-агародніных 475, рыбных 3,9. Прадукцыя К. п. БССР ідзе таксама на экспарт; дэманстравалася на міжнар. выстаўках і кірмашах (Парыж — 1968; Адыс-Абеба — 1969; Плоўдзіў — 1969, 1970; Бухарэст — 1970; Лейпцыг — 1970; Познань — 1970; Акра — 1970).

СССР па аб'ёме вытворчасці К. п. займае 2-е месца ў свеце (пасля ЗША); у 1970 выпушчана 10,6 млрд. ўмоўных слоікаў. З сацыяліст. краін найб. развіта ў Балгарыі, Румыніі, Венгрыі; сярод капіталіст. краін — у ЗША, Канадзе, Францыі і інш.

Літ.: Пищевая промышленность к 40-летию Белорусской ССР, Мн., 1958; Пищевая промышленность СССР, М., 1967; Мовшович Г. М. Экономика консервной промышленности, М., 1970.

Я. Я. Собалеў. Мінск.

КАНСЕРВАТО́РЫЯ (італьян. conservatorio першапачаткова прытулак), вышэйшая музычная навуч. ўстанова, якая рыхтуе высокакваліфікаваных музыкантаў-спецыялістаў — кампазітараў, спевакоў, выканаўцаў на муз. інструментах, музыказнаўцаў, педагогаў.

У 16 ст. ў Італіі К. называліся прытулкі для сірот, дзе навучалі побач з рознымі рамёствамі і музыцы. У музычныя ВНУ К. пачалі ператварацца ў Італіі; важным этапам стала арганізацыя Нац. муз. ін-та ў Парыжы (1793; з 1795 К. музыкі і дэкламацыі). У 19—20 ст. К. створаны ва ўсіх буйных муз. цэнтрах свету (у некат. краінах яны наз. муз. акадэміямі, вышэйшымі муз. школамі і інш.). Першыя рус. К.— Пецярбургская (1862) і Маскоўская (1866); у дарэвалюц. час адкрыты таксама К. ў Саратаве, Адэсе і Кіеве. У 1970 у СССР было 19 К. і 9 ВНУ са статусам К. (муз.-пед. ін-ты, ін-ты мастацтваў). *Беларуская кансерваторыя* існуе з 1932.

В. І. Ялатай. Мінск.

КАНСЕРВАЦЫЯ (лац. conservatio зберажэнне), 1) зберажэнне твораў мастацтва, археал. знаходак, рукапісаў, кніг, дакументаў, машын і інш. у спец. умовах, каб захаваць іх цэласць на доўгі час. К. цесна звязана з *рэстаўрацыяй*. 2) Спыненне на пэўны час будаўнічых работ або работы прадпрыемства.

КАНСЕ́РВЫ (лац. conservo захоўваю), харчовыя прадукты жывёльнага або раслінага паходжання, якія расфасаваны ў герметычную тару і прайшлі адпаведную апрацоўку (гл. *Кансерваванне харчовых прадуктаў*).

У СССР вырабляецца больш за 600 відаў К.: мясных, мяса-раслінных, агародніных, грыбных, пладовых, рыбных і інш. Тыпы К.: натуральныя, кулінарна-апрацаваныя, дыэтычныя, для дзіцячага харчавання. К. уласціва высокая каларыйнасць і добрая смакавая якасць; пажыўнасць сыравіны ў іх нават павышаецца ад дабаўлення тлушчу, цукру, соусу і інш. Большасць К. гатовыя да ўжывання і не патрабуюць дадатковай апрацоўкі (пладовыя, агародніныя, рыбныя, грыбныя). Зберагаюць К. ў сухім месцы пры т-ры 0—20 °С. Шмат відаў К. вырабляюць прадпрыемствы БССР (гл. *Кансервавая прамысловасць*).

Літ.: Справочник по производству консервов, под ред. В. И. Рогачева, т. 1—3, М., 1965—71; Наместников А. Ф. Качество консервов. Ассортимент, технология, стандартизация, М., 1967; Куренной Н. И. и Меньшикова В. А. Домашние консервы, 2 изд., Волгоград, 1967; Вольпер И. Н. Легенды и быль о продуктах, М., 1969.

А. А. Крупа. Мінск.

КАНСІЛІУМ (лац. consilium нарада), нарада ўрачоў для абмеркавання стану хворага, удакладнення дыягназу хваробы і спосабаў лячэння. К. неабходны ў выпадках няўпэўненасці ў дыягностыцы або спосабах лячэння, а таксама пры цяжкім стане хворага.

КАНСО́ЛЬ (франц. console), выступ на якой-небудзь канструкцыі, прызначаны ўспрымаць вертыкальную нагрузку. К. (адзін канец якой заштукаваны ў сцяну) падтрымлівае балконы, карнізы будынкаў, скульптурныя выявы і інш. У інтэр'еры — дэкар. столік каля сцяны (пераважна для люстэркаў) або падстаўка ў выглядзе калонкі (для ваз, статуэтак і інш.).



КАНСО́ЛЬНЫЯ СІСТЭ́МЫ (у будаўнічай механіцы), пясучыя канструкцыі, асноўныя элементы якіх (*кансолі*) выступаюць за апоры.



Схемы кансольных сістэм. Кансольна-бэлькавыя (*а*): *1* — кансольна-шарнірная бэлька; *2* — кансольна-бэлькавая ферма. Кансольна-арачныя (*б*): *1* — кансольна-шарнірная арка; *2* — кансольна-арачная ферма.

Па разліковай схеме адрозніваюць кансольна-бэлькавыя (*а*) і кансольна-арачныя (*б*). Многапралётныя К. с. ў параўнанні з некалькімі паслядоўна размешчанымі аднапралётнымі бэлькавымі маюць меншую вагу канструкцыі, а ў параўнанні з неразразнымі многапралётнымі бэлькамі — статычную азначальнасць і меншую адчувальнасць да нераўнамернай асадкі апор.

КАНСО́РЦЫУМ (лац. consortium таварыства, суполка), у капіталіст. краінах адна з формаў манаполій, пагадненне капіталістаў (пераважна банкаўскіх) для сумеснага вядзення фін. або камерцыйных аперацый, якія даюць вялікі прыбытак. Адна з формаў эрошчвання банкаўскага капіталу з прамысловым. Садзейнічае канцэнтрацыі і цэнтралізацыі капіталу. Імперыял. дзяржавы нярэдка выкарыстоўваюць К. у агрэсіўных мэтах. Напярэдадні 2-й сусв. вайны групы банкаў ЗША на чале з «Чэйз нэшанал банк» і «Дзілан, Рыд энд К°» фінансавалі стварэнне ваенна-эканам. базы германскага фашызму.

КАНСПІРА́ЦЫЯ (лац. conspiratio яднанне, змова), метады работы і форма пабудовы нелегальнай (падпольнай) арганізацыі; сістэма мер, якая забяспечвае тайну дзейнасці нелегальнай арг-цыі.

КАНСТАНТО́ВА, вёска ў Обальскім с/с Сенненскага р-на Віцебскай вобл., на р. Абалянка. Цэнтр калгаса «Сцяг перамогі». За 25 *км* на У ад Сянна, 76 *км* ад Віцебска, 15 *км* ад чыг. ст. Багушэўская. 160 ж., гасп. 63 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. Помнік на брацкай магіле 29 сав. воінаў Айч. вайны.

КАНСТАНЦІ́Н (г. н. і см. невяд.), князь віцебскі і полацкі ў 13 ст. Магчыма, сын *Таўцівіла*. У 1262 удзельнічаў у паходзе на Юр'еў супраць Лівонскага ордэна. У ноўгарадскім летапісе названы зяцем Аляксандра Неўскага. У час міжусобнай барацьбы супраць літ. князя Траняты выехаў у Ноўгарад, потым, відаць, вярнуўся ў Полацк, дзе ў 70—80-я г. 13 ст. княжыў Канстанцін Бязрукі.

Літ.: Пашуто В. Т. Образование Литовского государства, М., 1959.

КАНСТАНЦІ́Н Флавій Валерый, Канстанцін Вялікі (Flavius Valerius Constantinus Magnus; каля 285—337), рымскі імператар [306—337]. Прадаўжаў палітыку *Дыяклетыяна*. Заснаваў Канстанцінопаль (326), куды перанёс з Рыма сталіцу імперыі (330). Ажыццяўляў палітыку верацярпімасці. Пры К. хрысціянства стала дзярж. рэлігіяй і падтрымлівала імператарскую ўладу. Пры ім імперыя ператварылася ў ваенна-бюракратычную дзяржаву. Праўленне К. вызначалася стабілізацыяй унутранага жыцця імперыі: палепшылася становішча гарадоў, умацавалася манета, быў адбіты націск варвараў і інш. Аднак гэта не магло спыніць крызісу рабаўладальніцкага ладу.

КАНСТАНЦІ́Н VII Багранародны, Парфіранародны (Kōnstantinos; 17 ці 18.5.905—9.11.959), візантыйскі імператар з 913 (фактычна з 945). З Македонскай дынастыі. Правіў ва ўмовах бурнага працэсу феадалізацыі. Падтрымліваў сувязі з Захадам, арабскім халіфатам, Балгарыяй, Руссю. Вядомы як вучоны, апякун навук. Аўтар шэрагу гістар. твораў, у якіх упамінае і ўсх.-слав. плямёны крывічоў, дрыгавічоў і інш., апісвае ўрачысты прыём у Канстанцінопалі кіеўскай кн. Вольгі.

Тв.: Рус. пер.— Об управлении государством, «Известия Гос. академии истории материальной культуры», 1934, в. 91; О фемах и о народах, «Чтения в имп. Об-ве истории и древностей российских при Московском ун-те», 1899, кн. 1.

Літ.: История Византии, т. 2, М., 1967.

І. А. Юхо. Мінск.

КАНСТАНЦІ́НАВА, вёска ў Слабадскім с/с Мядзельскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса «1 Мая». За 30 *км* на З ад Мядзела, 180 *км* ад Мінска, 20 *км* ад чыг. ст. Варапаева, на аўтамаб. дарозе Мядзел — Вільнюс. 175 ж., двароў 60 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, клуб, фельч.-ак. пункт, магазін. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

КАНСТАНЦІ́НАЎ Барыс Паўлавіч [23.6(6.7).1910, Пецярбург — 9.7.1969], савецкі фізік. Акад. АН СССР (1960, чл.-кар. 1953), віцэ-прэзідэнт АН СССР (1966—69). Герой Сац. Працы (1954). Чл. КПСС з 1959. З 1927 працаваў у Фізіка-тэхн. ін-це АН СССР, у 1957—67 дырэктар гэтага ін-та. Навук. працы па тэарэт. і прыкладной акустыцы, фіз. хіміі, фізіцы ізатопаў, фізіцы плазмы, астрафізіцы, галаграфіі. Дзярж. прэмія СССР 1953, Ленінская прэмія 1958. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.



Літ.: Памяти Бориса Павловича Константинова, «Журнал технической физики», 1969, т. 39, в. 12; Борис Павлович Константинов, «Успехи физических наук», 1970, т. 100, в. 1 (бібліягр.).

КАНСТАНЦІ́НАЎ Фёдар Васілевіч [н. 8(21).2.1901, в. Навасёлкі Арэамаскага пав. Ніжагародскай губ.], савецкі філосаф. Акад. АН СССР (1964, чл.-кар. 1953). Чл. КПСС з 1918. Пасля заканчэння Ін-та чырвонай прафесуры (1932) вёў выкладчыцкую, навукова-даследчую і парт. работу. У 1946—51 працаваў



у Ін-це філасофіі АН СССР. Гал. рэдактар час. «Вопросы философии» (1951—54), рэктар Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС (1954—55), заг. аддзела агітацыі і прапаганды па саюзных рэспубліках ЦК КПСС (1955—58), гал. рэдактар час. ЦК КПСС «Коммунист» (1958—62), дырэктар Ін-та філасофіі АН СССР (1962—67), гал. рэдактар «Философской энциклопедии» (1960—70). З 1967 акадэмік-сакратар Аддзялення філасофіі і права АН СССР. З 1971 прэзідэнт Філас. т-ва СССР. Распрацоўвае тэарэт. праблемы грамадскага развіцця, гістар. матэрыялізму. Пад кіраўніцтвам К. створаны падручнік «Асновы марксісцка-ленінскай філасофіі» (1971). Узнаг. ордэнам Леніна, 5 інш. ордэнамі, медалямі.

Тв.: Исторический материализм, как наука, М., 1949; у кн.: Роль народных масс и личности в истории, М., 1957; у зб.: Марксистская и буржуазная социология сегодня, М., 1964; Социология и политика, у кн.: Социология в СССР, т. 1, М., 1965; За творческую разработку материалистической диалектики, у зб.: Ленинская теория отражения и современная наука, М., 1966; (у сааўт.) Марксизм-ленинизм — единое интернациональное учение, в. 1—2, М., 1968; Великий мыслитель нашей эпохи, у кн.: Ленин и современная наука, кн. 1, М., 1970.

«КАНСТАНЦІНАЎ ДАР» (лац. donatio Constantini), падложная грамата, складзеная ў 8 ст. пры папскім двары для юрыдычнага абгрунтавання тэакратычных дамаганняў папства на свецкую ўладу.

Італьян. гуманіст, вучоны-філолаг Ларэнца Вала ў памфлеце «Аб несапраўднасці дара Канстанціна» (1440; апубл. 1518) даказаў несапраўднасць дакумента, нанёс значны ўдар па аўтарытэце папства.

КАНСТРУКТЫВІЗМ (ад лац. constructio будова), адна з плыняў буржуазнага мастацтва, якая ўзнікла пасля 1-й сусв. вайны. Тэорыя К. свядома адмаўляе мастацтва ў традыцыйным разуменні, імкнецца замяніць яго «тэхнічнымі канструкцыямі».

У аснове К.— фетышызацыя тэхнікі, прычым самое паняцце «тэхнічнай рэчы» ператвараецца ў абстракцыю і на практыцы вядзе да беспрадметнага нагрувашчвання «тэхнічных» формаў, пазбаўленых зместу. У архітэктуру К. прынёс рацыянальныя элементы, выкарыстоўваючы найноўшыя дасягненні буд. тэхнікі (гл. ніжэй), а ў жывапісе выявіўся ў крайніх формах т. зв. беспрадметнага мастацтва і прыйшоў да бяссэнсавых канструкцый з жалеза, бляхі, дрэва, кардону і інш. У т-ры К. выявіўся пераважна ў дэкаратыўным мастацтве. Мастакі-канструктывісты адмаўляліся ад вобразных жывапісна-рэаліст. дэкаратыўнай і замянялі іх умоўнымі канструктывісцкімі ўстаноўкамі; гэта прыводзіла да фармалізму, абстрактнасці, змярцвелаці дэкаратыўны. К. ў музыцы ўласціва «будаванне» пазбаўленых эмац. зместу гукавых формаў, узнаўленне ў іх механічнага руху, шуму машын, сутаргавага рытму капіталіст. горада.

КАНСТРУКТЫВІЗМ (у архітэктуры), кірунак, які ўзнік у шмат якіх краінах пасля 1-й сусв. вайны. Пашыраны ў 20—30-я г. 20 ст. Гал. прынцыпам К. становіцца максімальная мэтазгоднасць планіровачных вырашэнняў і канструкцый, дакладная адпаведнасць будынка яго прызначэнню, эканамічнасць буд-ва. Маст. выразнасць выяўляецца праз лаканізм формаў.

Збудаваннем К. ўласцівыя геам. аб'ёмы, кантраст глухіх паверхняў сцен з вял. плошчамі шклення, плоскія дахі, гарызантальныя вокны, адкрытыя апоры ў ніжніх паверхах. На пэўным этапе К. садзейнічаў развіццю сусв. архітэктуры, але ператварэнне яго асн. прынцыпаў у догму прывяло да схематызму вырашэнняў, да эстэтызацыі спрошчаных формаў, недаацэнкі мясцовых умоў і нац. традыцый. У архітэктуры капіталіст. краін К. меў спецыфічныя адценні і назвы (рацыяналізм, «новая архітэктура») і быў часткаю больш шырокай з'явы — *функцыяналізму*. Найб. значныя прадстаўнікі — Ле Карбюзье (Францыя), В. Гропіус (Германія). Адгалоскі К. адбіліся ў шэрагу работ Л. Міс ван дэр Роэ (ЗША) і тэарэт. палажэнняў П. Л. Нерві (Італія). У сав. архітэктуры К. як плынь узнік у пач. 20-х г. Ён адлюстроўваў пошукі формаў, адпаведных новым сац. умовам жыцця, развіваў імкненні, якія выявіліся ў рэвалюц. перыяд у галіне канструявання маст. аб'ектаў. Асн. прынцыпы (мэтавгоднасць планіроўкі, лагічнасць і функцыянальнасць формаў будынка і яго канструкцый), абвешчаныя ў 1922, былі для канструктывістаў самамэтаю, дастатковай для вырашэння ідэйна-вобразных задач архітэктуры. Гэтыя прынцыпы ўвасоблены ў праекце Палаца працы ў Маскве (арх. А. і Л. Весніны), у шмат якіх іншых пабудовах і конкурсных праектах І. Мельнікава, М. Гінзбурга, І. Голасава і тэарэт. работах. Дзейнасць канструктывістаў працягвалася да арганізацыі Саюза савецкіх архітэктараў (1932).

На Беларусі ўплыў К. выявіўся ў 30-я г. ў будынках Дзярж. б-кі імя Леніна (іл. гл. ў арт. *Бібліятэка дзяржаўная БССР*), 1-й клінічнай бальніцы, фабрыкі-кухні (усе арх. Г. Лаўрова), клуба харчавікоў (А. Бураў), універсітэцкага гарадка (І. Запарожац, Лаўроў), Дзяржбанка (Г. Гольц) — усе ў Мінску; Дома-камуны (Г. Ханін; іл. гл. па ўкл. да арт. *Жыллё*) у Гомелі, кінатэатра «Чырвоная Зорка» (Э. Лосер) у Магілёве.

Літ.: Хазанова В. Э. Советская архитектура первых лет Октября. 1917—1925 гг., М., 1970.

Г. І. Апачынская. Масква; *С. П. Мульчэўская.* Мінск.

КАНСТРУКТЫЎНЫ КІРУНАК у матэматыцы, кірунак, сутнасць якога заключаецца ў тым, што даследуюцца т. зв. канструктыўныя матэматычныя аб'екты ў рамках *абстракцыі патэнцыяльнай ажыццяўлімасці* з поўным адмаўленнем ад *абстракцыі актуальнай бесканечнасці*. Паняцце канструктыўнага аб'екта не вызначаецца, а толькі тлумачыцца як вынік пабудовы паводле зададзеных правіл стандартнага тыпу, напр. словы ў некаторых фіксаваных алфавітах (гл. *Алфавіт* у тэорыі алгарытмаў). Паколькі ў К. к. стандартызацыі падлягаюць і аб'екты і аперацыі над імі, то канструктыўная матэматыка аперыруе з меншым лікам і больш вызначанымі па характары аб'ектамі, чым класічная. Аснову К. к. складае тэорыя алгарытмаў. На гэтай аснове распрацоўваюцца розныя раздзелы матэматыкі: канструктыўная алгебра, тэорыя лікаў, канструктыўны матэм. аналіз і інш., якія патрабуюць сваёй канструктыўнай матэм. логікі.

Перадумовай узнікнення К. к. з'явілася крытыка класічнай матэматыкі інтуіцыяністамі (Г. Вейль, Л. Браўэр, А. Гейтынг). Іх асн. ідэі — адмаўленне ад абстракцыі актуальнай бесканечнасці, крытэрый існавання аб'екта («існаваць — значыць быць пабудаваным») — абумовілі грунтоўныя рысы К. к. Аднак успрыняўшы рацыянальныя ідэі, канструктывісты крытыкуюць філасофскія погляды інтуіцыяністаў, у прыватнасці іх крытэрый існаванні ў матэматыцы — інтуітыўную яснасць сцвярджэння. Узнікшы на адной крытычнай глебе з *інтуіцыянізмам*, К.к. афарміўся і развіўся, абапіраючыся перш за ўсё на строгае паняцце *алгарытма*. Асабліва зручнай для мэт канструктыўнай матэматыкі а'лучляецца тэорыя нармальных алгарытмаў (гл. *Алгарытмаў тэорыя*). Рознагалоссе паміж сучасным класічным і К. к. у матэматыцы адносіцца ў асноўным да спец. пытання пра тое, якімі абстракцыямі і як можна карыстацца ў матэматыцы і логіцы. Гэта вылучляецца, напр., калі вырашаюць пытанне пра існаванне аб'екта. У класічнай матэматыцы даказваюцца шматлікія т. зв. «чыстыя тэарэмы існавання», дзе сцвярджаецца існаванне аб'екта з пэўнымі ўласцівасцямі, але не даецца спосаб яго пабудовы. Канструктыўная матэматыка адхіляе такія тэарэмы і лічыць існаванне аб'екта даказаным, калі толькі ўказваецца спосаб патэнцыяльна ажыццявімай пабудовы яго з дапамогай якой-н. канструкцыі з больш простых аб'ектаў. Вывучэнне ў К. к. праблемы алгарытмічнага рашэння задач і эфектыўныя спосабы доказаў, якія выкарыстоўваюцца ў ім, робяць больш адчувальнай сувязь паміж паняццямі матэматыкі і эксперым. матэрыялам прыродазнаўчых і тэхн. навук. У прыватнасці, канструктыўны матэматычны аналіз разглядае розныя матэм. з'явы з больш поўным улікам патрабаванняў вылічальнай матэматыкі, чым у класічным матэм. аналізе. Поспехі К. к. аднак не азначаюць, што абстракцыя актуальнай бесканечнасці страціла сваё значэнне. Многія тэорыі класічнай матэматыкі, якая пабудавана на ідэі актуальнай бесканечнасці, не падлягаюць поўнай канструктывісцкай рэформе, тым не менш яны эфектыўна выкарыстоўваюцца ў навуцы і тэхніцы. Гэта, напр., тэорыя функцый, класіч. камбінаторная тапалогія і інш., дзе пабудаваны канструктыўныя аналагі толькі для асобных паняццяў. К. к. дэманструе наяўнасць новага метаду пабудовы матэм. ведаў — канструктыўнага, ці генетычнага,— побач з пашыраным *аксіяматычным метадам*. Асабліва важнае значэнне К. к. набыў з развіццём вылічальнай тэхнікі, з распрацоўкай тэарэт. асноў кібернетыкі. Значную ролю ў развіцці К. к. адыгрывае сав. школа канструктыўнай матэматыкі (А. А. Маркаў, М. А. Шанін і інш.).

Літ.: Марков А. А. О конструктивной математике, М.— Л., 1962 (Труды Математического ин-та им. В. А. Стеклова, т. 67); Шанин Н. А. О конструктивном понимании математических суждений, (там жа, т. 52); Мальцев А. И. Конструктивные алгебры, «Успехи математических наук», 1961, т. 16, в. 3; Бунге М. Интуиция и наука, пер. с англ., М., 1967. *Т. У. Тамільчык.* Мінск.

КАНСТРУКЦЫЙНАЯ СТАЛЬ, сталь для вырабу дэталяў механізмаў і машын (машынабудаўнічая сталь) і металічных канструкцый (будаўнічая сталь).

Машынабудаўнічыя К. с. паводле хім. саставу падзяляюцца на вуглародзістыя і легіраваныя. Вуглародзістыя бываюць звычайнай якасці (напр., Ст. 5), якасныя (з нармальным, напр., сталь 40, і павышаным, напр., сталь 40Г, утрыманнем марганцу) і спец. прызначэння (для катлабудавання, мостабудавання, аўтаматнай, паніжанага прагартоўвання). Легіраваная К. с., акрамя нізкалегіраванай, бывае якасная (напр., сталь 18ХГТ) і высакаякасная (напр., 12ХН3А). У асобныя групы К. с. выдзяляюць: сталь для халоднай штампоўкі і высадкі, рысорна-спружынавая, сталь для пракатных валкоў, сталь для адлівак (вуглародзістая і легіраваная). Каб палепшыць мех. ўласцівасці нізкавуглародзістых К. с., робяць хіміка-тэрмічную апрацоўку (напр., цэментацыю), вуглародзістых — тэрмічную апрацоўку (напр., загартоўку). Для буд. канструкцый ужываюць пераважна К. с. нізкавуглародзістую звычайнай якасці (найб. пашырана Ст. 3) і нізкалегіраваную (14Г2, 15ГС і інш.). Нізкавуглародзістая — высокапластычная, добра зварваецца, нізкалегіраваная адрозніваецца больш высокай трываласцю, ударнай вязкасцю, каразійнай стойкасцю.

Літ.: Материалы в машиностроении, т. 2 — Конструкционная сталь, М., 1967; Справочник металлиста, т. 2, М., 1965; Марочник стали для машиностроения, 2 изд., М., 1968. *Ф. Ф. Азёмша.* Мінск.

КАНСТЫТУЦЫЙНА - ДЭМАКРАТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ, гл. *Кадэты*.

КАНСТЫТУЦЫЙНА-КАТАЛІЦКАЯ ПАРТЫЯ Літвы і Беларусі, памешчыцкая клерыкальная арг-цыя, якая мела на мэце адцягнуць сялян ад рэвалюц. барацьбы і прымірыць іх з памешчыкамі на аснове праграмы кадэтаў і догматаў каталіцкай царквы.

Створана ў канцы 1905 — пач. 1906 віленскім каталіцкім епіскапам Э. Ю. Ропам. Цесна супрацоўнічала з польскай Нарадова-дэмакр. партыяй. Мела курсы навучання ксяндзоў метадам барацьбы з рэвалюц. рухам, выдавала газ. «Nowiny Wileńskie» («Віленскія навіны», польск.). Патрабавала абл. самакіравання для Беларусі і Літвы і аўтаноміі з заканадаўчым сеймам для Польшчы. Рашэнне аграрнага і інш. сац. пытанняў звязвала з устанаўленнем мясц. самакіравання. Адстойвала захаванне памешчыцкага землеўладання, выказвалася за садзеянне сялянам у набыцці зямлі. Дзейнічала пераважна ў Віленскай і некат. паветах Гродзенскай губ., дзе большасць насельніцтва складалі католікі. На выбарах у 1-ю Дзярж. думу блакіравалася з кадэтамі і дамаглася значнага поспеху: з 7 дэпутатаў ад Віленскай губ. 6 — прыхільнікі К.-к. п., з інш. зах. губерняў К.-к. п. падтрымлівала 11 дэпутатаў (т. зв. аўтанамісты). У 2-й думе ідэі К.-к. п. падтрымлівала 11 аўтанамістаў. Распалася ўвосень 1907 у выніку рэпрэсій царызму.

Літ.: Шабуня К. И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905—1907 гг., Мн., 1962, с. 381—382.

М. В. Біч. Мінск.

КАНСТЫТУЦЫЯ (лац. constitutio упарадкаванне), асноўны закон дзяржавы, які замацоўвае грамадскі і дзярж. лад, прынцыпы арганізацыі і дзейнасці органаў дзярж. улады, выбарчую сістэму, асноўныя правы і абавязкі грамадзян. К. прымаецца ў асобым парадку вышэйшым заканадаўчым органам дзяржавы, спецыяльна скліканым органам (напр., Устаноўчы сход) або рэферэндумам. Змена К. ажыццяўляецца гэтымі ж органамі і таксама ў асобым парадку (напр., неабходна атрымаць кваліфікаваную большасць у $^2/_3$ галасоў пры галасаванні за кожную папраўку). К.— аснова бягучага заканадаўства: ёй павінны адпавядаць усе законы, што выдаюцца.

Першыя К. як асноўны закон дзяржавы ўзніклі ў выніку бурж. рэвалюцый 17—18 ст. У Еўропе — К. Францыі, прынятыя ў 1791, 1793, 1795, 1799, у Амерыцы — К. ЗША 1781 і 1787. У некат. дзяржавах (Вялікабрытанія і інш.) К. як адзінага закону няма, замест іх дзейнічаюць асобныя канстытуцыйныя акты. К. бурж. дзяржаў замацоўваюць дыктатуру буржуазіі і выгадныя ёй парадкі. Іх аснову складаюць прыватная ўласнасць на прылады і сродкі вытворчасці і эксплуатацыя чалавека чалавекам. Бурж. К. фармальна абвяшчаюць роўнасць усіх грамадзян, дэмакр. правы і свабоды, але фактычнае іх ажыццяўленне ва ўмовах капіталізму немагчыма. У перыяд імперыялізму буржуазія ўсё больш расшырае паўнамоцтвы выканаўчай улады за кошт заканадаўчых органаў, што вядзе да выдання законаў, якія супярэчаць К. і парушаюць іх.

У адрозненне ад К. бурж. дзяржаў *Канстытуцыя СССР* і К. інш. сацыяліст. краін сапраўды дэмакратычныя, замацоўваюць заваёвы працоўных мас і служаць іх інтарэсам. Гл. таксама *Канстытуцыя БССР*.

Г. А. Маслыка. Мінск.

КАНСТЫТУЦЫЯ 3 МАЯ 1791, асноўны закон Рэчы Паспалітай, прыняты 3.5.1791 на сейме ў Варшаве. Адлюстроўвала барацьбу буржуазіі, якая нараджалася, з феадалізмам. Захоўвала феад. грамадскі лад з некат. зме-

намі: расшырала правы багатых мяшчан, абвяшчала апеку права і ўрада над феадальназалежнымі сялянамі, але залежнасць не ліквідавала. Скасоўвала унію (саюз) Вял. кн. Літ. з Польшчай і аб'ядноўвала абедзве дзяржавы.

Паводле К. ствараўся адзіны ўрад у складзе кароля (старшыня), прымаса (галава каталіцкага духавенства) і 5 міністраў: паліцыі, пячаткі (кіраўнік канцылярыі і ўнутраных спраў), вайны, скарбу і замежных спраў. У сейме скасоўвалася «ліберум вета» і ўсе пастановы павінны былі прымацца большасцю галасоў. Для таго часу К. была прагрэсіўнай, хаця яе палажэнні і не былі здзейснены з-за *Таргавіцкай канфедэрацыі* 1792 і ўмяшання замежных дзяржаў. Скасавана *Гродзенскім сеймам* 1793.

Кр.: Хрестоматия памятников феодального государства и права стран Европы, М., 1961, с. 788—798; Volumina legum, t. 9, Kraków, 1889.

Літ.: Kaczmarczyk Z. i Leśnodorski B. Historia państwa i prawa Polski od połowy XV w. do r. 1795. Warszawa, 1957. *І. А. Юхо.* Мінск.

КАНСТЫТУЦЫЯ БССР, асноўны закон Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, які замацоўвае грамадскі і дзярж. лад, сістэму, прынцыпы арганізацыі і дзейнасці дзярж. органаў, асноўныя правы і абавязкі грамадзян, выбарчую сістэму.

Першая К. БССР прынята 3.2.1919 I Усебеларускім з'ездам Саветаў. Заканадаўча замацавала перамогу Вял. Кастр. сацыяліст. рэвалюцыі на Беларусі, вызначыла асн. задачы дзяржавы: умацаванне дыктатуры пралетарыяту, задушэнне супраціўлення скінутых класаў, знішчэнне эксплуатацыі чалавека чалавекам, ліквідацыю падзелу грамадства на класы, пабудову сацыялізма; абвясціла дэмакр. правы і свабоды, гарантавала працоўным іх ажыццяўленне. Адмяніла прыватную ўласнасць на зямлю, абвясціла лясы, нетры і воды дзярж. здабыткам. Другая К. БССР прынята 11.4.1927 VIII Усебеларускім з'ездам Саветаў. Замацавала дасягненні бел. народа ў пабудове сацыялізма, адлюстравала факт аб'яднання БССР і інш. саюзных рэспублік у адзіную саюзную дзяржаву, вызначыла суверэнныя правы БССР у складзе СССР. Індустрыялізацыя краіны і калектывізацыя с. гасп., ліквідацыя эксплуататарскіх класаў, разгром нацыяналіст. контррэвалюцыі, стварэнне новай (нац. па форме і сацыяліст. па зместу) культуры, перамога сацыялізма выклікалі неабходнасць прыняць новую канстытуцыю.

Дзейная К. БССР прынята 19.2.1937 Надзвычайным XII Усебеларускім з'ездам Саветаў. Складаецца з 11 раздзелаў: 1) грамадскі лад; 2) дзяржаўны лад; 3) вышэйшыя органы дзярж. улады БССР; 4) органы дзярж. кіравання БССР; 5) мясцовыя органы дзярж. улады; 6) бюджэт БССР; 7) суд і пракуратура; 8) асноўныя правы і абавязкі грамадзян; 9) выбарчая сістэма; 10) герб, сцяг, сталіца; 11) парадак змянення Канстытуцыі. Як і канстытуцыі інш. саюзных рэспублік, пабудавана на аснове і ў адпаведнасці з Канстытуцыяй СССР, што абумоўлена адзінствам эканам., паліт. і ідэалагічнага развіцця ўсіх саюзных рэспублік. Адлюстроўвае і нац. асаблівасці рэспублікі. У К. БССР запісана, што БССР — сацыяліст. дзяржава рабочых і сялян. Паліт. аснову БССР складаюць Саветы дэпутатаў працоўных. Эканам. аснова БССР — сацыяліст. сістэма гаспадаркі і сацыяліст. ўласнасць, якая мае 2 формы: дзяржаўную і кааператыўна-калгасную. К. БССР вызначыла працу як абавязак і справу гонару кожнага працаздольнага грамадзяніна, замацавала прынцып сацыялізма «ад кожнага — па яго здольнасці, кожнаму — па яго працы», аб'яднанне БССР на роўных правах з усімі інш. саюзнымі рэспублікамі ў Саюз ССР, забеспячэнне за СССР у асобе яго вышэйшых органаў улады і дзярж. кіравання правоў, запісаных у арт. 14 Канстытуцыі СССР 1936, суверэнныя правы БССР, яе адм.-тэр. падзел і кампетэнцыю. Вышэйшы орган дзярж. улады рэспублікі — *Вярхоўны Савет Беларускай ССР*, які выбіраецца на 4 гады, а ў перыяд паміж сесіямі — *Прэзідыум Вярхоўнага Савета Беларускай ССР*. Вярх. Савет БССР з'яўляецца таксама і адзіным заканадаўчым органам БССР. Вышэйшы выканаўчы і распарадчы орган — *Савет Міністраў Беларускай ССР*, які падсправаздачны Вярх. Савету БССР і адказны перад ім. Мясцовыя органы дзярж. улады: абласныя, раённыя, гарадскія, раённыя ў гарадах, пасялковыя і сельскія Саветы дэп. працоўных, якія выбіраюцца на 2 гады. Правасуддзе ажыццяўляюць: Вярх. суд БССР, абл. суды, нар. суды, а таксама спец. суды СССР. Вышэйшы нагляд за дакладным выкананнем законаў на тэр. БССР ажыццяўляе як Генеральны пракурор СССР непасрэдна, так і Пракурор БССР. Усе органы дзярж. улады БССР выбіраюцца на аснове ўсеагульнага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні. К. БССР замацавала асн. правы і свабоды грамадзян: права на працу, адпачынак, адукацыю, свабоду слова, друку, сходаў і мітынгаў і інш. Усім грамадзянам БССР незалежна ад іх полу, расы, нацыянальнасці, сац. паходжання дадзены роўныя правы ва ўсіх галінах гаспадарчага, дзярж., культурнага і грамадска-паліт. жыцця. Грамадзяне ўсіх інш. саюзных рэспублік карыстаюцца на тэр. БССР аднолькавымі правамі з грамадзянамі БССР. У К. БССР няма абмежаванняў дэмакр. правоў і свабод грамадзян, што ўласціва канстытуцыям бурж. дзяржаў. Яна не толькі абвяшчае правы і свабоды, але і гарантуе працоўным іх фактычнае ажыццяўленне. К. БССР глыбока інтэрнацыянальная, што выяўляецца ў замацаванні раўнапраўя грамадзян незалежна ад іх нацыянальнасці, і ў тым, што яна дае права прытулку замежным грамадзянам, якія праследуюцца за абарону інтарэсаў працоўных, навук. дзейнасць, нац.-вызв. барацьбу. К. БССР можа быць зменена толькі паводле рашэння Вярх. Савета БССР, прынятага большасцю, не менш як ⅔ галасоў. З часу прыняцця К. БССР у яе ўнесены змены, што абумоўлена расшырэннем суверэнных правоў БССР. За БССР замацавана права ўступаць у непасрэдныя зносіны з замежнымі дзяржавамі, заключаць з імі пагадненні і абменьвацца дыпламат. і консульскімі прадстаўнікамі, права прымаць крымінальны, грамадзянскі, працэсуальныя і інш. кодэксы, вырашаць пытанні адм.-тэр. падзелу рэспублікі, пытанні кіравання прамысловасцю і будаўніцтвам саюзна-рэсп. падпарадкавання.

Кр.: Канстытуцыя (Асноўны Закон) Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Мн., 1971.

Літ.: Вихарев С. Р., В. И. Ленин о суверенитете союзных республик, Мн., 1969; яго ж. Суверенитет Белорусской ССР в составе Союза ССР, Мн., 1958; Маргунский С. П. Создание и упрочение белорусской государственности. 1917—1922, Мн., 1958; Вихарев С. Р. и Ветров И. Д. Расширение прав союзных республик. (Историко-правовой очерк на материалах Белорусской ССР), М., 1963; гл. таксама пры арт. *Канстытуцыя СССР*.

В. А. Дарожін. Мінск.

КАНСТЫТУЦЫЯ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ЖЫВЁЛЫ, сукупнасць марфалагічных, фізіялагічных і прадукцыйных асаблівасцей жывёлы. Фарміруецца пад уплывам спадчыннасці і ўмоў індывідуальнага развіцця.

У залежнасці ад віду жывёлы і кірунку прадукцыйнасці вылучаюць грубы, далікатны, шчытны і рыхлы тыпы К. с. ж. Грубая і далікатная канстытуцыя можа быць шчытная або рыхлая. У сувязі з гэтым адрозніваюць грубую шчытную, грубую рыхлую, далікатную шчытную і далікатную рыхлую К. с. ж.

Літ.: Борисенко Е. Я. Разведение сельскохозяйственных животных, 4 изд., М., 1967.

КАНСТЫТУЦЫЯ СССР, асноўны закон Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, які замацоўвае грамадскі і дзяржаўны лад, прынцыпы арганізацыі і дзейнасці дзярж. органаў, выбарчую сістэму, асноўныя правы і абавязкі грамадзян.

Першая К. СССР прынята 31.1.1924 II Усесаюзным з'ездам Саветаў. Складалася з *Дэкларацыі аб утварэнні СССР* і *Дагавору аб утварэнні СССР*. У яе распрацоўцы актыўны ўдзел бралі саюзныя рэспублікі, якія ў стварэнні СССР бачылі гарантыю сваёй незалежнасці, эканам., нац. і культ. развіцця. К. СССР заканадаўча замацавала суверэнітэт СССР і саюзных рэспублік, вызначыла кампетэнцыю СССР як саюзнай дзяржавы ў асобе вышэйшых органаў дзярж. улады (з'езд Саветаў СССР, а ў перыяд паміж з'ездамі — ЦВК СССР, які складаўся з 2 палат — Саюзнага Савета і Савета Нацыянальнасцей) і органаў дзярж. кіравання (Савета Народных Камісараў СССР). Яна адыграла вялікую ролю ў барацьбе сав. народа за пабудову сацыялізма, стварала ўмовы для ліквідацыі фактычнай (гаспадарчай і культурнай) няроўнасці паміж нацыянальнасцямі. Індустрыялізацыя краіны і калектывізацыя с. гасп. прывялі да значных змен у сацыяльна-эканам. жыцці СССР, якія выклікалі неабходнасць прыняць новую Канстытуцыю. Паводле рашэнняў лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б) (1935) і VIII Усесаюзнага з'езду Саветаў (1935) створана Канстытуцыйная камісія, якой даручалася падрыхтаваць унясенне змен у Канстытуцыю для далейшай дэмакратызацыі выбарчай сістэмы (замяніць не зусім роўныя выбары роўнымі, шматступенныя — прамымі, адкрытыя — закрытымі), прывесці Канстытуцыю ў адпаведнасць з сусветнымі класавых сіл, якія склаліся на той час (стварэнне сацыяліст. індустрыі, разгром кулацтва, перамога калгаснага ладу, усталяванне сацыяліст. уласнасці як асновы сав. грамадства і інш.). У чэрв. 1936 камісія падрыхтавала праект новай К. СССР, які быў апублікаваны для ўсенароднага абмеркавання.

5.12.1936 Надзвычайны VIII Усесаюзны з'езд Саветаў зацвердзіў новую К. СССР і пастанавіў дзень яе прыняцця лічыць усенародным святам. Яна адлюстравала і заканадаўча замацавала перамогу сацыялізма ў СССР. У К. СССР запісана, што СССР — сацыяліст. дзяржава рабочых і сялян. Уся ўлада ў СССР належыць працоўным горада і вёскі ў асобе Саветаў дэп. працоўных. Упершыню абвясціла і замацавала сацыяліст. сістэму гаспадаркі і сацыяліст. ўласнасць у 2 формах (дзяржаўнай і калгасна-кааператыўнай) эканамічнай асновай СССР, а працу — абавязкам і справай гонару кожнага працаздольнага грамадзяніна, ліквідавала абмежаванні пры выбарах у Саветы, вызначыла ўсеагульныя, роўныя і прамыя выбары пры тайным галасаванні. Замацавала добраахвотнае аб'яднанне раўнапраўных саюзных рэспублік і іх суверэнныя правы ў адзінай саюзнай дзяржаве, вызначыла кампетэнцыю СССР у асобе найвышэйшых органаў дзярж. улады і органаў дзярж. кіравання. Істотна змяніла арганіз. будову сістэмы дзярж. органаў, вызначыла прынцыпы іх арганізацыі і кампетэнцыю. Замест Усесаюзнага з'езду Саветаў, ЦВК і яго Прэзідыума, рэспубліканскіх і мясцовых з'ездаў Саветаў былі створаны Вярх. Савет СССР і Прэзідыум Вярх. Савета СССР, адпаведныя Вярх. Саветы і Прэзідыумы ў рэспубліках, абласныя, гарадскія, раённыя, пасялковыя і сельскія Саветы дэпутатаў працоўных. Вышэйшы орган дзярж. улады — Вярх. Савет СССР, які з'яўляецца вышэйшым заканадаўчым органам. Ён складаецца з 2 палат: Савета Саюза і Савета Нацыянальнасцей. У саюзных і аўт. рэспубліках заканадаўчую ўладу ажыццяўляюць Вярх. Саветы гэтых рэспублік. Вышэйшы выканаўча-распарадчы орган СССР — Савет Міністраў СССР, а ў рэспубліках — Саветы Міністраў рэспублік. Усе органы дзярж. улады выбіраюцца народам і падсправаздачныя перад ім. Правасуддзе здзяйсняюць Вярх. Суд СССР, вярх. суды саюзных рэспублік, краявыя і абласныя суды, вярх. суды аўт. рэспублік і аўт. абласцей, акруговыя, раённыя, гарадскія (народныя) суды. Найвышэйшы нагляд за дакладным выкананнем законаў ажыццяўляе Ген. пракурор СССР. К. СССР замацавала асноўныя правы грамадзян СССР: права на працу, адпачынак, адукацыю, матэрыяльнае забеспячэнне па старасці, а таксама ў выпадку хваробы і страты працаздольнасці; раўнапраўнасць грамадзян незалежна ад іх расы, нацыянальнасці, полу; гарантавала працоўным свабоду слова, друку, сходаў і мітынгаў, сумлення; права аб'ядноўвацца ў грамадскія арг-цыі працоўных. К. СССР не абмяжоўваецца абвяшчэннем дэмакр. правоў і свабод, а гал. ўвагу аддае іх фактычнаму забеспячэнню. Грамадзяне СССР маюць і абавязкі: захоўваць Канстытуцыю і выконваць законы, захоўваць дысцыпліну працы, добрасумленна ставіцца да грамадскага абавязку, берагчы і ўмацоўваць сацыяліст. ўласнасць як свяшчэнную і недатыкальную аснову сав. ладу. К. СССР заканадаўча замацавала кіруючую ролю Камуніст. партыі Сав. Саюза як перадавога атрада працоўных у іх барацьбе за пабудову камунізма. К. СССР мае свае асаблівасці: 1) яна — вынік заваёў сав. народа, які пабудаваў сацыяліст. грамадства; 2) яе аснову складаюць прынцыпы сацыялізма — сацыяліст. сістэма гаспадаркі і сацыяліст. ўласнасць на прылады працы і сродкі вытворчасці, ліквідацыя эксплуататарскіх класаў і эксплуатацыі, ліквідацыя беспрацоўя; 3) яна выходзіць з таго, што ў СССР няма антаганістычных класаў, што сав. грамадства складаецца з двух дружалюбных класаў — рабочых і сялян; 4) глыбока інтэрнацыянальная — замацоўвае раўнапраўнасць нацый, дружбу

народаў; 5) паслядоўна дэмакратычная — дае ўсім грамадзянам роўныя правы ва ўсіх галінах гасп., дзярж., культурнага і грамадска-паліт. жыцця незалежна ад іх паходжання, сац. становішча, полу, нацыянальнасці і расы; 6) не толькі абвяшчае правы і свабоды, але і забяспечвае іх ажыццяўленне. З часу прыняцця К. СССР у яе ўнесены змены і дадаткі, выкліканыя далейшым развіццём СССР, удасканаленнем дзярж. органаў. Паводле закону ад 1.2.1944 саюзным рэспублікам дадзена права ўступаць у непасрэдныя зносіны з замежнымі дзяржавамі, заключаць з імі пагадненні і абменьвацца дыпламатычнымі і консульскімі прадстаўнікамі. У 1957 да кампетэнцыі саюзных рэспублік аднесена вырашэнне пытанняў іх краявога, абласнога і раённага адм.-тэр. падзелу, прыняцце кодэксаў саюзных рэспублік. Гэта садзейнічала далейшаму ўмацаванню іх суверэнітэту і нац. незалежнасці. К. СССР мае вялікую мабілізацыйную і арганізацыйную ролю ў жыцці сав. народа, з'яўляецца маральным стымулам у барацьбе працоўных усяго свету супраць імперыялізму за дэмакратыю і сацыялізм, за ўмацаванне міжнар. бяспекі і ўсеагульнага міру.

Кр.: Канстытуцыя (Асноўны Закон) Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, Мн., 1970.

Літ.: Ленин В. И. О советском строительстве, М., 1957; История Советской Конституции (в документах). 1917—1956, М., 1957; Советские конституции. Справочник, М., 1963; Кравцов Б. П. и Калинычев Ф. И. Советская Конституция и ее историческое развитие, М., 1967.

В. А. Дарогін. Мінск.

КАНСТЫТУЦЫЯ ЧАЛАВЕ́КА, сукупнасць функцыянальных і анатамічных асаблівасцей арганізма, якая склалася ў пэўных прыродных і сац. умовах і вызначае яго рэакцыю на ўздзеянне знешніх, у т. л. хваробных фактараў навакольнага асяроддзя.

Абумоўлена спадчыннасцю і набытымі ўласцівасцямі, можа змяняцца і не прадвызначае хваробы ў будучым. На аснове марфалагічных прыкмет (асаблівасцей складу цела) існуе больш за 50 класіфікацый К. ч. (В. В. Бунак, А. А. Багамолец, М. В. Чарнаруцкі). Асн. іх недахоп у тым, што яны не ўлічваюць ролі нерв. сістэмы. Сучаснае вучэнне пра К. ч. ўключае, як важнейшую складаную частку, тыпалагічную характарыстыку вышэйшай нервовай дзейнасці і стан усіх аддзелаў нерв. сістэмы і эндакрынных залоз.

Літ.: Башкиров П. Н. Некоторые теоретические вопросы учения о конституции человека, «Советская антропология», 1958, № 3.

КАНТ (ад лац. cantus спевы, песня), свецкая бытавая харавая песня-гімн 16—19 ст. Колькасць галасоў — ад аднаго да пяці (пераважае трохгалоссе). У аснове К.— сілабічны рыфмаваны верш; характэрны ўстойлівыя кадэнцыйныя звароты, секвенцыі як прынцып муз. развіцця ў спалучэнні з літаральнай і варыяцыйнай паўторнасцю, шматчастковасць, багацце рытмаформул, паралельны рух верхніх галасоў (побач з тэрцавымі часта трапляюцца квартавыя, а таксама квінтавыя паралелізмы).

К. паявіліся ў зах.-слав. народаў (у Польшчы вядомыя ў 16 ст.), з канца 16 ст. пашырыліся на Беларусі і Украіне, з 2-й пал. 17 ст. пры пасрэдніцтве бел. і ўкр. дзеячаў — у Расіі (пры цары Аляксеі Міхайлавічы ў Маскве працавалі бел. пеўчыя І. Кокля, І. Календа і інш.; першы зборнік рус. К. створаны ў 1680 Сімяонам Полацкім з кампазітарам В. Цітовым). Усюды К. мелі мясцовыя асаблівасці, развіваліся самабытна пад уплывам нар.-песеннай культуры. На Беларусі стала традыцыяй мужчынскае хар. выкананне К.; складаліся К. ў акадэміях, семінарыях, павятовых і прыходскіх школах, пазней у купецкім, мяшчанскім асяроддзі, спяваліся ў народзе пераважна на святы. Асн. жанры: псальмы (К. на рэліг. тэматыку), віваты (урачыстыя прывітальныя К.), лірычныя, жартоўныя, сатыр. і інш. Адзін з найб. ранніх бел. К., што дайшлі да нашага часу ў запісе, належыць А. Філіповічу (1645). Распаўсюджваліся ў рукапісах у 17—18 і часткова ў 19 ст., запісваліся кіеўскай натацыяй і крукамі; трапляюцца і друкаваныя К. Вядома, што тэксты К. і псальмаў Пачаеўскага багагласніка пеліся на мелодыі, створаныя мясцовымі сялянамі-беларусамі. Папулярны на Беларусі жартоўны К. «Пра камара». Рысы кантавай стылістыкі (рытмаінтанацыі шэсця, тыповыя рытмаформулы, меладычныя звароты, кадэнцыі, секвенцыі, строфіка) пранікаюць у мелодыку некат. бел. нар. песень.

Л. П. Касцюкавец. Мінск.

КАНТ (Kant) Імануіл (22.4.1724, г. Кёнігсберг — 12.2.1804), нямецкі філосаф, родапачынальнік нямецкага класічнага ідэалізму. Скончыў Кёнігсбергскі ун-т (1745), дзе працаваў прыват-дацэнтам (з 1755) і прафесарам (з 1770). У творчай біяграфіі К. адрозніваюць два перыяды: дакрытычны (да пач. 70-х г. 18 ст.) і крытычны. Першаму перыяду характэрны працы па пытаннях прыродазнаўства. Значэнне іх — у спробе тлумачыць прыроду з яе самой і ў пастаноўцы пытання аб развіцці ў прыродзе. К. выклаў касмаганічную гіпотэзу пра паходжанне Сонечнай сістэмы (гл. ў арт. *Касмагонія*), якая зрабіла першы сур'ёзны ўдар па метафізічным светапоглядзе, які панаваў у прыродазнаўстве 18 ст. Асн. творы крытычнага перыяду: «Крытыка чыстага розуму» (1781), «Крытыка практычнага розуму» (1788), «Крытыка здольнасці суджэння» (1790). Пазнанне, паводле К., пачынаецца з таго, што рэчы, якія існуюць незалежна ад свядомасці, уздзейнічаюць на органы пачуццяў і выклікаюць адчуванні. Аднак ні адчуванні, ні паняцці і «ідэі» розуму не могуць даць ведаў аб саміх прадметах вонкавага свету. Рэчы прынцыпова непазнавальныя і ў гэтым сэнсе з'яўляюцца «рэчамі ў сабе». Пазнанне мае справу толькі са «з'явамі», якія дадзены ў пачуццёвым вопыце. Вонкавы свет дае толькі матэрыю адчування, а пазнавальная здольнасць чалавека ўпарадкоўвае гэтую матэрыю ў прасторы і часе і дае паняцці, з дапамогай якіх мы разумеем вопыт. Такім чынам, «крытычная філасофія» К.— прымірэнне матэрыялізму з ідэалізмам, *агнастыцызмам*. «Калі Кант,— пісаў У. І. Ленін,— дапускае, што нашым уяўленням адпавядае нешта па-за намі, нейкая рэч у сабе,— то тут Кант матэрыяліст. Калі ён аб'яўляе гэтую рэч у сабе непазнавальнай, ...Кант выступае як ідэаліст» (Тв., т. 14, с. 185). Тое, што з'яўляецца нам ва

ўспрыманні, лічыць К., складаецца з адчування (таго, што абумоўлена аб'ектам) і формы (таго, што абумоўлена свядомасцю). Форма не ёсць само адчуванне, яна апрыёрная — не залежыць ад вопыту. Паводле К., веданне заўсёды складаецца са спалучэння (сінтэзу) адчуванняў з паняццямі на аснове «трансцэндэнтальных схем» — апрыёрнай функцыі свядомасці, пры дапамозе якой «будуецца» прадмет. Гэты вывад К.— суб'ектыўны ідэалізм. Этыцы К. характэрна вучэнне пра аўтаномію (незалежнасць) маралі. Як маральная сутнасць чалавек падпарадкоўваецца толькі маральнаму закону — т. зв. катэгарычнаму імператыву, які вызначаецца чыстым практ. розумам. Эстэтыка К. супярэчлівая. Эстэт. суджэнне, паводле К., заснавана не на паняцці, а на асаблівай прыемнасці, якую дае сузіранне формы эстэт. прадмета. У сац.-паліт. поглядах К. прыхільнік (непаслядоўны) ідэй франц. і англійскага Асветніцтва. Супярэчнасці філасофіі К. выклікалі, як адзначаў У. І. Ленін, крытыку злева і справа. Злева К. крытыкавалі матэрыялісты за агнастыцызм і суб'ектывізм, справа — скептыкі і ідэалісты за «рэч у сабе», якую ён дапускаў. На Беларусі і ў Літве філасофія К. вядома з канца 18 ст. Ю. Быхавец (1778—1845) пераклаў на польскую мову і выдаў у Кёнігсберзе і ў Вільні некат. творы К., у т. л. трактат «Да вечнага свету», прапагандаваў яго філасофію ў сваіх працах. Праф. Віленскага ун-та Ян Г. Абіхт (1762—1816) чытаў лекцыі ў духу вучэння К. З пазіцый асветніцкай філасофіі крытыкавалі суб'ектыўны ідэалізм, апрыярызм і агнастыцызм Канта Ян Снядэцкі і А. Доўгірд.

Тв.: Рус. пер.— Соч., т. 1—6, М., 1963—66.

Літ.: Маркс К. и Энгельс Ф. Немецкая идеология, Соч., т. 3; Энгельс Ф. Людвіг Феербах і канец класічнай нямецкай філасофіі, Мн., 1953; Ленін У. І. Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм, Тв., т. 14 (Полн. собр. соч., т. 18); Асмус В. Ф. Диалектика Канта, 2 изд., М., 1930; яго ж. Философия Иммануила Канта, М., 1957; Шашкевич П. Д. Теория познания Канта, М., 1960; Каменский З. А., И. Кант в русской философии начала XIX века, «Вестник истории мировой культуры», 1960, № 1.

М. В. Рожын, А. А. Бірала. Мінск.

КАНТА́КТ ГЕАЛАГІ́ЧНЫ (ад лац. contactus сутыкненне), паверхня ці зона сутыкнення горных парод.

Адрозніваюць К. г. стратыграфічныя, калі асадкавыя пароды залягаюць на больш стараж. асадкавых, метамарфічных ці магматычных пародах; тэктанічныя, калі пароды прылягаюць па паверхні тэктанічнага разрыву; магматычныя — зоны сутыкнення магматычных парод з больш стараж. ўмяшчальнымі пародамі, якія прарываюцца магмай. Вывучэнне К. г. вельмі важна для вызначэння ўзаемаадносін і геал. ўзросту горных парод, з імі найчасцей звязаны карысныя выкапні.

КАНТА́КТАВАЯ ЗВА́РКА, від *электрычнай зваркі*, пры якой дэталі злучаюцца награваннем эл. токам у месцы кантакту і сціскаННем. Адзін з найб. прадукцыйных і аўтаматызаваных спосабаў зваркі. Шырока выкарыстоўваецца ў аўтатрактарным, с.-г. машынабудаванні, у электроннай і буд. прамысловасці, вагонабудаванні.

Асн. віды К. з. (гл. рыс.): кропкавая (*а*), шыўная або ролікавая (*б*), стыкавая (*в*). Кропкавай і шыўной зваркай злучаюць пераважна ліставыя



Прынцыповыя схемы кантактавай зваркі: *а* — кропкавай; *б* — шыўной (ролікавай); *в* — стыкавай. *1* — дэталі, што зварваюцца; *2* — электроды; *3* — зварачны трансфарматар; *4* — прыціскныя губкі.

канструкцыі таўшчынёю ад некалькіх сотых *мм* да 4—5 *мм*; зварное злучэнне — бесперапынны рад «кропак» (пры шыўной) або асобныя кропкі-кружкі (пры кропкавай). Стыкавай К. з. злучаюць стрыжні, трубы, дрот па ўсёй кантактавай паверхні. Галоўныя параметры працэсу К. з.— велічыня зварачнага току, час яго дзеяння і намаганне сціскання дэталяў пры зварцы (*P*). Асн. машыны: для кропкавай і шыўной К. з.— МТП, МШП, МТ, МШ, для стыкавай — МСР, МСМУ, МСГУ, МСО.

Літ.: Кабанов Н. С. и Слепак Э. Ш. Технология стыковой контактной сварки, М., 1970; Чулошников П. Л. Точечная и роликовая электросварка легированных сталей и сплавов, М., 1968.

Б. М. Данілка. Мінск.

КАНТА́КТАВАЯ РО́ЗНАСЦЬ ПАТЭНЦЫЯЛАЎ, рознасць патэнцыялаў, якая ўзнікае паміж двума разнароднымі целамі (металічнымі, паўправадніковымі) пры непасрэдным іх датыканні. Прычына ўзнікнення — наяўнасць электронаў праводнасці ў металах і паўправадніках, якія пры кантакце здольныя пераходзіць з аднаго цела ў другое.

Колькасць электронаў, што перайшлі, вызначаецца *работай выхаду*: больш электронаў пераходзіць з цела з меншай работай выхаду. Гэтае цела набывае дадатны зарад. Другое датыкальнае цела набывае адмоўны зарад, і ў вобласці кантакту ўзнікае эл. поле, накіраванае так, што яно перашкаджае далейшаму пераходу электронаў з цела з меншай работай выхаду і спрыяе пераходу электронаў з другога цела. У выніку ўстанаўліваецца аднолькавая колькасць электронаў, што пераходзяць у той і другі бок, а ў месцы кантакту — пастаянная рознасць патэнцыялаў, якую наз. К. р. п. Велічыня К. р. п. залежыць ад прыроды целаў і можа дасягаць некалькіх вольт. Адыгрывае важную ролю ў фіз. працэсах, што адбываюцца ў розных прыладах (вакуумных, газавых, паўправадніковых).

Літ.: Царев Б. М. Контактная разность потенциалов и ее влияние на работу электровакуумных приборов, 2 изд., М., 1955; Фриш С. Э. и Тиморева А. В. Курс общей физики, т. 2, 9 изд., М., 1962.

І. Р. Некрашэвіч. Мінск.

КАНТА́КТАВАЯ СЕ́ТКА, сістэма кантактавых правадоў (рэек) і канструкцый, якія іх падтрымліваюць, прызначаная для перадачы эл. энергіі ад цягавых падстанцый электра-

возам і маторным вагонам праз рухомы кантакт.

К. с. падзяляюцца на сістэмы з падвяснымі кантактавымі правадамі (больш пашыраныя — трамвай, тралейбус і чыг. электратранспарт) і сістэмы з кантактавай рэйкай (у метро, рудніках). Першыя бываюць аднаправодныя (на трамвайных і чыг. лініях пастаяннага ці аднафазнага току) і двухправодныя (на тралейбусных лініях і пры трохфазным току на рэйкавых дарогах). На наземных лініях сілавы провад К. с. размяшчаецца над рухомым саставам, на падземных рабочым провадам з'яўляецца трэцяя (не хадавая) рэйка. Перадача эл. энергіі ажыццяўляецца з дапамогаю слізгальнага токапрыёмніка. Правады К. с. ізалююцца ад апораў.

КАНТАКТАВЫ МЕТАМАРФІЗМ, гл. ў арт. *Метамарфізм горных парод.*

КАНТАКТАВЫЯ РАДОВІШЧЫ, прамысл. скопішчы карысных выкапняў, якія ўзнікаюць у зямной кары на кантакце магматычных целаў з умяшчальнымі пародамі.

Падзяляюцца на кантактава-метамарфічныя і кантактава-метасаматычныя. Першыя ўзнікаюць ад дзеяння высокай т-ры на ўмяшчальныя пароды; пры ўтварэнні другіх у пароды пранікаюць лятучыя кампаненты (пара вады, бору, хлору, фтору) і цяжкія металы. Асабліва падлеглыя кантактаваму метамарфізму карбанатныя пароды (гл. *Скарн*). К. р.— важная крыніца руд жалеза, хрому, медзі, цынку, свінцу, вальфраму, малібдэну, золата, а таксама неметалічных карысных выкапняў — мармуру, карунду, андалузіту.

Літ.: Жариков В. А. Скарновые месторождения, у кн.: Генезис эндогенных рудных месторождений, М., 1968; Основные проблемы в учении о магматогенных рудных месторождениях, 2 изд., М., 1955; Смирнов В. И. Геология полезных ископаемых, М., 1969.

КАНТАКТАР, камутацыйны апарат для частых дыстанцыйных замыканняў і размыканняў эл. ланцугоў напружаннем да 500 *в*.

Ужываецца пры намінальных токах да 600 *а*. К. пастаяннага току (адна- і двухполюсныя) прызначаны пераважна для кіравання эл. рухавікамі пастаяннага току (трамвай, тралейбус, электравоз і інш.), а К. пераменнага току (трох- і многаполюсныя) — для кіравання асінхроннымі эл. машынамі (прыводы станкоў, ліфтаў, кранаў). Выкарыстоўваюцца ў аўтаматызаваных вытв. устаноўках. У ланцугах кіравання пры рабочым току да 40 *а* выкарыстоўваюцца таксама блок-кантактары; яны маюць некалькі груп кантактаў, якія замыкаюць і размыкаюць эл. ланцугі. Паводле тыпу прывода К. бываюць электрамагнітныя, пнеўматычныя і гідраўлічныя. У электрамагнітных К. кантакты замыкаюцца з дапамогаю электрамагніта і якара, размыкаюцца ад дзеяння спружыны ці вагі рухомых частак. К. могуць рабіць да 1500 уключэнняў за гадзіну.



Кантактар пераменнага току: *1* — электрамагніт; *2* — якар; *3* — дугагасільныя камеры; *4* — рухомыя кантакты.

Літ.: Красин В. П. Электрические аппараты автоматического управления, Мн., 1970.

КАНТАКТЫ (у паўправадніковых прыладах), злучэнні: *паўправаднікоў* з рознымі тыпамі праводнасці, металу з паўправаднікам, паўправаднікоў з рознай канцэнтрацыяй дамешак і інш. Асн. ўласцівасць К.— наяўнасць т. зв. запіральнага слоя, што ствараецца з прычыны рознасці *работ выхаду* электронаў злучаных рэчываў.

Выпрамныя (нелінейныя) К. маюць нелінейную вольт-амперную характарыстыку, нізкае супраціўленне ў прамым напрамку току і даволі высокае ў адваротным, што выкарыстоўваецца для выпрамлення пераменных сігналаў. Найлепшыя выпрамныя ўласцівасці маюць К. паўправадніка з металам і асабліва К. двух паўправаднікоў з рознымі тыпамі праводнасці (электронна-дзірачны пераход, гл. *Пераходы*). Гэтыя К. шырока выкарыстоўваюцца пры вырабе *дыёдаў паўправадніковых, транзістараў* і інш. паўправадніковых прылад. Пры К. паўправаднікоў з праводнасцю аднаго тыпу, але з рознымі работамі выхаду таксама ствараецца запіральны слой. Аднак знешняе напружанне, прыкладзенае да такога К., амаль усё падае на запіральным слоі, таму як выпрамныя гэтыя К. не выкарыстоўваюцца, прамыя токі ў іх малыя. У паўправадніковых прыладах выкарыстоўваюцца таксама амічныя (лінейныя) К., у якіх выпрамны эфект амаль ці поўнасцю адсутнічае (напр., К. паўправаднікоў з рознай канцэнтрацыяй дамешак). Такія К. маюць практычна аднолькавую праводнасць у прамым і адваротным напрамку і вольт-амперную характарыстыку, блізкую да лінейнай. Амічныя К. ствараюцца, напр., у месцах злучэння металічных вывадаў з паўправадніком у дыёдах і транзістарах.

Літ.: Гл. пры арт. *Паўправаднікі.*

КАНТАМІНАЦЫЯ (лац. contaminatio сутыкненне, аб'яднанне), узаемадзеянне моўных адзінак, у выніку якога адбываецца семантычная ці фармальная змена іх або ўтвараецца новая (трэцяя) моўная адзінка. Напр., слова «сёлета» ўтварылася ў выніку ўзаемадзеяння слоў «сяго» і «лета». Кампаненты ў новым слове іншы раз акрэслены вельмі выразна, іншы раз зменены непазнавальна, зберагаючы толькі адзін гук.

КАНТАРОВІЧ Леанід Віталевіч [н. 6(19).1. 1912, Пецярбург], сав. матэматык і эканаміст. Акад. АН СССР (1964, чл.-кар. 1958). З 1961 нам. дырэктара Ін-та матэматыкі Сіб. аддз. АН СССР. Навук. працы па тэорыі функцый сапраўд. пераменнага, функцыян. аналізе і яго дастасаваннях у вылічальнай матэматыцы, прыбліжаных метадах вылічэнняў, выкарыстаннях матэм. метадаў у эканоміцы. Дзярж. прэмія СССР 1949, Ленінская прэмія 1965. Узнаг. ордэнам Леніна, 3 інш. ордэнамі, медалямі.



Тв.: (Разам з Г. П. Акілавым) Функциональный анализ в нормированных пространствах, М., 1959; Экономический расчет наилучшего использования ресурсов, М., 1960; (разам з У. І. Крыловым) Приближенные методы высшего анализа, 5 изд., М.—Л., 1962.

Літ.: Леонид Витальевич Канторович. «Успехи математических наук», 1962, т. 17, в. 4 (бібліягр.).

КАНТАРОВІЧ Леў Ісакавіч [5(18).8.1903, мяст. Любонічы Бабруйскага пав. Мінскай губ.— 30.10.1958], беларускі савецкі вучоны ў галіне акушэрства і гінекалогіі. Д-р мед. н. (1958). Чл. КПСС з 1930. Скончыў БДУ (1928). У 1930—58 працаваў на кафедры акушэрства і гінекалогіі Мінскага мед. ін-та. Удзельнік Айч. вайны. Асн. працы па праблемах плацэнтарнай крыві і пазаматачнай цяжарнасці. Узнаг. 8 ордэнамі, медалямі.

Тв.: (Разам з В. Н. Шатэрнікам) Клиника внематочной беременности, Мн., 1936; Плацентарная

кровь и применение ее для целей переливания в акушерстве и гинекологии, Мн., 1940; (разам з В. М. Брукам) Гемоплацентарная терапия недоношенных детей в период новорожденности, «Здравоохранение Белоруссии», 1957, № 10.

Літ.: Памяти Л. И. Кантаровича, «Здравоохранение Белоруссии», 1958, № 11.

КАНТАТА (італьян. cantata ад cantare спяваць), вялікі музычны твор урачыстага ці лірыка-эпічнага характару для спевакоў-салістаў, хору і аркестра. Складаецца з шэрагу самастойных нумароў, якія звычайна чаргуюцца па прынцыпе кантрасту. Структурна блізкая да араторыі, адрозніваецца ад яе меншымі памерамі, менш развітым сюжэтам, але большым адзінствам эмац. зместу.

Узнікла ў Італіі на мяжы 16—17 ст. і развівалася спачатку ў свецкай і духоўнай формах. Пазней аформілася пераважна як канцэртны жанр. Выдатныя ўзоры К. ў зах.-еўрап. музыцы стварыў І. С. Бах. Найб. значныя рус. кантаты П. Чайкоўскага, С. Танеева, С. Рахманінава. Сав. кампазітары (С. Пракоф'еў, Ю. Шапорын, Дз. Шастаковіч, Г. Свірыдаў, А. Аруцюнян і інш.), аддаючы вял. ўвагу жанру К., развілі яго ў кірунку ўзбагачэння тэматыкі, узмацнення грамадзянска-патрыят. матываў, дэмакратызацыі муз. мовы. Гэтыя тэндэнцыі выразна выявіліся і ў бел. музыцы (К. «Над ракой Арэсай» і «40 гадоў» М. Аладава, «Беларускім партызанам», «Беларусь», «Леніну слава» і «Беларускія песні» А. Багатырова, «Палі стэпавыя» І. Кузняцова, «Курган» І. Лучанка, «Піянерскі касцёр міру» П. Падкавырава, «Памяці Канстанціна Заслонава» Ю. Семянякі, «Я Леніна пяю» Э. Тырманд, «Кантата пра Леніна» К. Цесакова, і інш.). Цяпер паявіліся буйныя вак.-сімф. формы, блізкія да К.: паэмы, балады, дэкламаторыі і інш.

Літ.: Хохловкина А. А. Советская оратория и кантата, М., 1955; Гісторыя беларускай савецкай музыкі, Мн., 1971. *В. І. Ялатаў.* Мінск.

КАНТРАБАНДА (італьян. contrabando ад contra супраць+bando урадавы ўказ), незаконнае (без ведама таможных устаноў) перамяшчэнне цераз дзярж. граніцу тавараў або інш. каштоўнасцей, а таксама хаванне і продаж гэтых тавараў унутры дзяржавы; тавар, тайна правезены або пранесены цераз дзярж. граніцу.

Паводле сав. заканадаўства асобы, якія займаюцца К., прыцягваюцца да адміністрацыйнай (арт. 101 Таможнага кодэксу СССР) або крымінальнай (арт. 75 КК БССР) адказнасці: пазбаўляюцца волі ад 3 да 10 гадоў з канфіскацыяй маёмасці. У імперыял. краінах К. займаюцца спецыялізаваныя гангстэрскія арг-цыі. Найб. пашырана К. наркотыкаў. К. ваенная (у міжнар. праве) — правоз у адну з дзяржаў, якая ваюе, ваен. грузаў, дастаўка якіх забаронена другой дзяржавай.

КАНТРАБАС (італьян. contrabasso), 1) самы вялікі памерам і самы нізкі гучаннем струнны смыковы музычны інструмент.

Развіўся з кантрабасавай віёлы і збярог рысы падабенства да віёльнай сям'і (пакатыя плечы, настройка па квартах : E_1, A_1, D, G; трапляюцца К. з 5 і 3 струнамі). Партыя К. натуецца на актаву вышэй за рэальнае гучанне. Пераважна арк. інструмент, радзей ансамблевы, часам сольны канцэртны (творы для К. напісаны С. Кусявіцкім, у бел. музыцы канцэрт і саната для К. належаць А. Багатырову).



2) Самая нізкая па гучанні разнавіднасць пэўнага інструмента (напр., К.-цымбалы, К.-балалайка).

КАНТРАКТ (ад лац. contractus дагавор), пагадненне дзвюх або некалькіх асоб, накіраванае на ўстанаўленне, змяненне ці спыненне грамадзянскіх праваадносін. Гл. *Дагавор.*

КАНТРАКТАЦЫЯ, заключэнне кантракта, дагавору; у СССР форма дзярж. нарыхтовак с.-г. прадуктаў, якая ажыццяўляецца на аснове дагавору паміж нарыхтоўшчыкам (кантрактантам) і пастаўшчыком.

Уведзена ў 1928 на збожжавыя культуры, бульбу, воўну, мяса, малако і інш. с.-г. прадукты. Адыграла важную ролю ў сацыяліст. рэканструкцыі с. гасп., устанаўленні цвёрдых эканам. сувязей паміж горадам і вёскай, у барацьбе са спекуляцыяй. У 1933 заменена сістэмай абавязковых паставак і асталася як форма нарыхтовак для тэхн., лекавых, цытрусавых культур. З 1961 — адзіная форма нарыхтовак с.-г. прадуктаў. Паводле дагавору пастаўшчык (калгас, калгаснік) абавязаны здаць кантрактанту (нарыхтоўчай арг-цыі ці прадпрыемству) прадукцыю пэўнай колькасці, якасці і ў вызначаны тэрмін. Кантрактант на сваім транспарце прымае прадукцыю і аплочвае яе (паводле тыповых дагавораў вяртае пастаўшчыку адходы перапрацоўкі с.-г. прадуктаў — абястлушчанае малако, жамерыны і інш.). Арг-цыю закупак с.-г. прадуктаў і сыравіны, кантроль за выкананнем абавязацельстваў К. ажыццяўляюць Мін-вы нарыхтовак СССР і саюзных рэспублік, у раёнах — дзярж. інспекцыі па закупках.

Літ.: Коровяковский Д. З. Заготовки сельскохозяйственных продуктов и экономика колхозов, М., 1968; Экономика и организация государственных заготовок продуктов сельского хозяйства, М., 1969; Баховкина Л. Н. Государственные закупки сельскохозяйственных продуктов в колхозах, М., 1961. *М. Я. Суманаў.* Мінск.

КАНТРАКЦЫЙНАЯ ГІПОТЭЗА, гл. ў арт. *Тэктанічныя гіпотэзы.*

КАНТРАЛЬТА (італьян. contralto), самы нізкі жаночы голас. Дыяпазон f — g^2.

КАНТРАПУНКТ (ням. Kontrapunkt ад лац. punctum contra punctum літар. кропка супраць кропкі), 1) від шматгалосся, заснаваны на адначасовым гарманічным спалучэнні некалькіх самастойных галасоў, а таксама навука пра выразныя ўласцівасці, разнавіднасці і правілы падобных спалучэнняў; тое, што *поліфанія.* 2) Мелодыя, якая гучыць адначасова з асн. мелодыяй — тэмай.

КАНТРОЛЬ ГРАМАДСКІ, праверка грамадскасцю выканання дырэктыў партыі і ўрада, законаў і інш. актаў, што выдаюцца органамі Савецкай дзяржавы. Ажыццяўляецца пярвічнымі партыйнымі, прафсаюзнымі, камсамольскімі, кааператыўнымі арг-цыямі, дамавымі, вулічнымі к-тамі, грамадскімі камісіямі па ахове сацыяліст. уласнасці на прадпрыемствах, пазаштатнымі аддзеламі выканкомаў мясцовых Саветаў дэпутатаў працоўных, пазаштатнымі інспектарамі дзярж. інспекцый і асобнымі грамадзянамі (пісьмы, заявы, скаргі і інш.). З'яўляецца важнай формай удзелу сав. грамадзян у дзярж., гасп. і сац.-культурным буд-ве. Асобнае месца ў ажыццяўленні К. г. займаюць групы і пасты нар. кантролю (гл. *Кантроль народны*).

Органы К. г. не надзелены такімі правамоцтвамі, як *кантроль дзяржаўны.* Яны не маюць права адмяняць ці спыняць адм. распараджэнні. Калі ў выніку праверкі выяўляюцца недахопы і парушэнні ў дзейнасці адміністрацыі або службовых асоб, К. г. паведамляе пра гэта парт. к-там, кіраўніцтву прадпрыемства, каб разам прыняць меры для іх ліквідацыі і прыцягнуць да адказнасці вінаватых. Расшыраецца роля пярвічных парт. арганізацый у

ажыццяўленні К. г. Паводле рашэнняў XXIV з'езду КПСС побач з вытв. партарганізацыямі права кантролю дзейнасці адміністрацыі даецца пярвічным партарганізацыям усіх праектных арг-цый, канструктарскіх бюро, НДІ, навучальных, культурна-асветных, лячэбных і інш. устаноў і арганізацый, функцыі адміністрацыі якіх не выходзяць за рамкі сваіх калектываў. Партарганізацыі міп-ваў, дзярж. камітэтаў, цэнтральных і мясцовых савецкіх, гасп. устаноў, ведамстваў ажыццяўляюць кантроль за работай апарату па выкананні дырэктыў партыі і ўрада, захаванні сав. законаў. *Літ.*: Гл. пры арт. *Кантроль дзяржаўны.*

А. А. Галаўко. Мінск.

КАНТРОЛЬ ДЗЯРЖАЎНЫ, праверка вытворчай, гаспадарчай, фінансавай і інш. дзейнасці дзяржаўных, кааператыўных арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, што ажыццяўляецца органамі дзярж. улады і кіравання ў СССР. Адзін з метадаў дзярж. кіраўніцтва.

Бывае агульны і спецыяльны, унутраны і знешні, папярэдні, бягучы і паслядоўны. Агульны кантроль ахоплівае ўсю дзейнасць прадпрыемства, што правяраецца, спецыяльны праводзіцца па якім-н. канкрэтным пытанні. Унутр. кантроль — праверка вышэйшымі арг-цыямі прадпрыемстваў, што ім падпарадкоўваюцца, знешні—праверка прадпрыемстваў іншым дзярж. органам, які не ўваходзіць у гэтую сістэму. Папярэдні ажыццяўляецца на стадыі падрыхтоўкі фактычнага выканання, бягучы — у працэсе выканання, паслядоўны кантроль — пасля фактычнага выканання адпаведных заданняў. К. дз. ў СССР ажыццяўляюць Саветы дэпутатаў працоўных у цэнтры і на месцах — яны правяраюць дзейнасць выканаўча-распарадчых органаў, што самі ствараюць. Пры неабходнасці Вярх. Савет СССР, Вярх. Саветы саюзных і аўт. рэспублік утвараюць следчыя і рэвіз. камісіі, патрабаванні якіх абавязковыя для ўсіх органаў кіравання і службовых асоб. К. дз. ажыццяўляюць таксама фінансавыя і крэдытныя органы (Мін-ва фінансаў СССР, Дзяржбанк СССР, Будбанк СССР); органы міжгалінавай кампетэнцыі (Дзяржплан СССР, ЦСУ СССР); спец. агульнадзярж. кантрольныя органы (Дзяржгандальінспекцыя, Дзярж. паляўнічая інспекцыя, Дзяржсаніінспекцыя, Дзяржаўтаінспекцыя і інш.), паўнамоцтвы якіх пашыраны на арганізацыі, прадпрыемствы і ўстановы, незалежна ад іх ведамаснага падпарадкавання, а ў некат. выпадках і на грамадзян; усе выканаўча-распарадчыя органы ў галіне сваёй дзейнасці. Памагаюць дзярж. органам грамадскія арг-цыі (гл. *Кантроль грамадскі*).

Органы К. дз. робяць праверкі і па іх выніках, у рамках сваёй кампетэнцыі, даюць абавязковыя для выканання распараджэнні, накладваюць на вінаватых у парушэннях дысцыплінарныя або адм. спагнанні (штраф, грашовае налічэнне і інш.), адхіляюць ці звальняюць з пасады, перадаюць матэрыялы на разгляд таварыскага суда, а пры выяўленні злачынных дзеянняў службовых асоб накіроўваюць матэрыялы ў органы пракуратуры. Асобнае месца ў ажыццяўленні К. дз. займаюць камітэты нар. кантролю (гл. ў арт. *Кантроль народны*).

Літ.: Ленин В. И. О партийном, государственном и общественном контроле, 2 изд., М., 1971; Государственный и общественный контроль в СССР, 2 изд., М., 1970. *В. І. Семянкоў.* Мінск.

КАНТРОЛЬ НАРОДНЫ, праверка выканання дырэктыў партыі і ўрада, законаў міністэрствамі, ведамствамі, установамі, арганізацыямі, прадпрыемствамі і службовымі асобамі, што ажыццяўляецца спецыяльна ўтворанай сістэмай органаў народнага кантролю ў СССР; форма ўдзелу грамадзян у кіраванні дзяржавай. Прынцыпы арганізацыі і дзейнасці К. н. сфармуляваны У. І. Леніным.

Органы К. н.: Камітэт народнага кантролю СССР, камітэты нар. кантролю саюзных (гл. *Камітэт народнага кантролю БССР*) і аўт. рэспублік, краявыя, абласныя к-ты нар. кантролю, аўт. абласцей, акруговыя, гарадскія і раённыя к-ты нар. кантролю, групы і пасты нар. кантролю пры сельскіх і пасялковых Саветах дэпутатаў працоўных, на прадпрыемствах, у калгасах, установах, арг-цыях і ў вайск. часцях. У сваёй дзейнасці органы К. н. кіруюцца рашэннямі партыі і ўрада, заканадаўствам СССР, Палажэннем аб органах народнага кантролю ў СССР ад 19.12.1968. Асноўны сістэмы органаў К. н.— групы і пасты нар. кантролю. Выбіраюцца на 2 гады на сходах калектываў працоўных або жыхароў населеных пунктаў з ліку перадавых, найбольш актыўных грамадзян — камуністаў і беспартыйных. Абласныя, раённыя, гарадскія, акруговыя і краявыя камітэты К. н. ўтвараюцца адпаведнымі Саветамі дэпутатаў працоўных. Яны працуюць пад кіраўніцтвам адпаведных парт. і сав. органаў, вышэйстаячых к-таў нар. кантролю. Іх старшыні назначаюцца гэтымі Саветамі. Камітэты К. н. саюзных і аўт. рэспублік зацвярджаюцца Саветамі Міністраў, іх старшыні назначаюцца Вярх. Саветамі гэтых рэспублік. Камітэты нар. кантролю саюзных рэспублік працуюць пад кіраўніцтвам ЦК кампартый і Саветаў Міністраў саюзных рэспублік, Камітэта нар. кантролю СССР. Камітэты нар. кантролю аўт. рэспублік працуюць пад кіраўніцтвам абкомаў партыі, Саветаў Міністраў гэтых рэспублік і вышэйстаячых к-таў нар. кантролю. Камітэт нар. кантролю СССР зацвярджаецца Саветам Міністраў СССР, старшыня яго назначаецца Вярх. Саветам СССР. Органы К. н. правяраюць выкананне дзярж. планаў і заданняў; вядуць барацьбу за выяўленне і выкарыстанне рэзерваў нар. гасп., павышэнне эфектыўнасці грамадскай вытворчасці, эканомнае выдаткаванне працоўных, матэрыяльных рэсурсаў і грашовых сродкаў, укараненне ў вытворчасць новага, прагрэсіўнага; выступаюць супраць парушэнняў дзярж. дысцыпліны, месніцтва, ведамаснага падыходу да справы, супраць безгаспадарчасці, любых спроб ашукання дзяржавы, замахаў на сацыяліст. маёмасць; спыняюць праяўленні бюракратызму і цяжаніны, дамагаюцца ўдасканалення работы дзярж. апарату, укаранення навук. арганізацыі працы і кіравання, зладжанай пастаноўкі ведамаснага кантролю. Сістэматычна ажыццяўляюць кантроль за выкананнем службовымі асобамі сав. законаў пры разглядзе прапаноў, заяў і скаргаў грамадзян; папярэджваюць кадры ад памылак і промахаў у рабоце, дамагаюцца ліквідацыі выяўленых недахопаў. Для гэтага сваю работу будуюць на аснове публічнасці, выкарыстоўваючы друк, радыё, тэлебачанне. Органы К. н. працуюць на аснове прынцыпу калектыўнасці: практ. пытанні вырашаюць разам з адпаведнымі парт., сав., гасп., прафсаюзнымі, камсамольскімі і інш. арг-цыямі. Групы і пасты К. н. ажыццяўляюць кантроль непасрэдна на прадпрыемствах, у калгасах, ва ўстановах, арг-цыях. Яны наладжваюць праверкі, рэйды, удзельнічаюць у праверках і рэвізіях іх вытв. і фін. дзейнасці, якую ажыццяўляюць вышэйстаячыя органы. Па выніках праверак заслухоўваюць асоб, вінаватых у зрыве вытв. планаў і заданняў, і тых, хто парушаў дзярж. дысцыпліну, дапускаў бюракратызм, цяганіну, безгаспадарчасць і злоўжыванне, выносяць ім грамадскія ганьбаванні, перадаюць справы на разгляд таварыскіх судоў, ставяць перад адміністрацыяй, парт. і інш. грамадскімі арг-цыямі пытанні, якія ўзнікаюць у выніку праверак, і пытанні аб прыцягненні да адказнасці работнікаў; вінаватых у недахопах.

Камітэт нар. кантролю СССР, к-ты нар. кантролю саюзных і аўт. рэспублік, краявыя, абласныя, акруговыя, гарадскія, раённыя к-ты нар. кантролю маюць права патрабаваць у кіраўнікоў неабходныя для кантролю дакументы і матэрыялы, заслухоўваць тлумачэнні і даклады па выніках праверак; даваць указанні па ліквідацыі выяўленых недахопаў і парушэнняў, назначаць і ажыццяўляць рэвізіі гасп.-фін. дзейнасці, спыняць незаконныя распараджэнні і дзеянні службовых асоб,

папярэджваць іх, накладваць на вінаватых спагнанні (ставіць на від, даваць вымову, строгую вымову, рабіць грашовыя налічэнні, адхіляць ад пасады, накіроўваць у органы пракуратуры матэрыялы пра злачынныя дзеянні службовых асоб). Камітэт нар. кантролю СССР — саюзна-рэспубліканскі орган, працуе пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР, накіроўвае дзейнасць усіх органаў К. н. ў краіне. Па выніках праверкі ўносіць у ЦК КПСС і Савет Міністраў СССР прапановы, якія маюць агульнадзярж. значэнне, робіць даклады пра становішча спраў у асобных галінах нар. гасп., пра арганізацыю работы ў міп-вах і ведамствах. У БССР дзейнічае Камітэт нар. кантролю БССР, 6 абласных, 18 гарадскіх, 15 раённых у гарадах і 117 раённых сельскіх камітэтаў нар. кантролю. Выбрана 15 684 групы і 15 653 пасты К. н., у якіх удзельнічаюць 315 тыс. чалавек.

Літ.: Туровцев В. М. Народный контроль, М., 1970; Народный контролер. Справочник, М., 1970; Залужный В. И. Народный контроль в современных условиях, М., 1970.

М. І. Лагір. Мінск.

КАНТРОЛЬ РУБЛЁМ, тэрмін, які абазначае форму эканамічнага кантролю з дапамогай вартасных катэгорый (цэн, фінансаў, крэдыту, сабекошту і інш.) і ўліку вынікаў гасп. дзейнасці прадпрыемстваў.

Неабходная ўмова *гаспадарчага разліку*. Садзейнічае рацыянальнаму выкарыстанню сродкаў, выкананню і перавыкананню вытв. планаў. Ажыццяўляецца ва ўзаемаадносінах прадпрыемстваў з фін.-крэдытнай сістэмай (банкаўскі і фінансавы К. р.), з вышэйшымі гасп. арг-цыямі, паміж прадпрыемствамі (узаемны), у працэсе вытв. дзейнасці прадпрыемства (унутраны). Роля К. р. асабліва ўзрастае ва ўмовах гасп. рэформы, якая ажыццяўляецца паводле рашэння вераснёўскага (1965) Пленума ЦК КПСС.

КАНТРОЛЬНА-ВЫМЯРАЛЬНАЯ ТЭХНІКА, комплекс прылад для вымярэння і кантролю фіз. велічынь, параметраў вытворчых працэсаў і з'яў у прыродзе. Да іх адносяцца *датчыкі, вымяральныя інструменты* і *вымяральныя прылады.*

Прылады К.-в. т. падзяляюцца на стацыянарныя, калі выраб ці працэс кантралюецца на месцы ўстаноўкі вымяральнай прылады; пераносныя, якія даюць магчымасць вымяраць вырабы на месцы іх вытворчасці, і дыстанцыйнага дзеяння (напр., прыём тэлеметрычнай інфармацыі са штучных спадарожнікаў Зямлі, аўтам. міжпланетных станцый і касмічных караблёў). Паводле адлюстравання вынікаў вымярэння прылады К.-в. т. бываюць з візуальным адлікам, графічнай, лічбавай рэгістрацыяй або з выхадным сігналам, які ўздзейнічае на інш. прыстасаванні. Асновай К.-в. т. з'яўляецца сістэма эталонаў, прыкладных мер і прылад. Выбар і нармалізацыя яе сродкаў ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі Дзярж. сістэмы прылад (ДСП). У К.-в. т. шырока выкарыстоўваецца пераўтварэнне параметраў, што нясуць інфармацыю пра вынік вымярэння, у мех., пнеўм., гідраўлічны, эл. і інш. сігналы; гэта дае магчымасць забяспечваць хуткую і дакладную перадачу атрыманай інфармацыі на рэгулятары і выканаўчыя механізмы, якія кіруюць ходам вытв. працэсу. К.-в. т. шырока ўжываецца ў навуцы, многіх галінах нар. гасп., пашырана ў прамысловасці для вымярэння і кантролю мех. перамяшчэнняў, саставу рэчываў, колькасці і якасці дэталяў, ходу хім. рэакцый, тэмпературы, ціску, эл. параметраў і г. д. Шмат тыпаў прылад К.-в. т. вырабляюць прыладабудаўнічыя з-ды БССР.

Літ.: Соловцов В. К. Контрольно-измерительные приборы, 3 изд., М., 1969; Диденко К. И. и Гусева Ж. А. Новая аппаратура контроля и регулирования, М., 1961; Кошарский Б. Д. и др. Автоматические приборы, регуляторы и управляющие машины, Л., 1968.

В. К. Бензар. Мінск.

КАНТРОЛЬНА-КАСАВЫ АПАРАТ, лічыльна-падсумавальная машына, якая паскарае і механізуе работу касіра, лічыць ўтаргаваныя грошы, папярэджвае недакладнасці ў падліках, кантралюе ўсе касавыя аперацыі ў гандл. прадпрыемствах.



Клавішны кантрольна-касавы апарат: *1* — клавішы для набірання сум; *2* — пускавая педаль; *3* — грашовая скрынка; *4* — акно кантрольнай стужкі; *5* — кантрольная стужка; *6* — чэкавая стужка; *7* — друкавальны механізм; *8* — паказальнік набранай сумы.

Паводле спосабу набіраць сумы К.-к. а. бываюць клавішныя (гл. рыс.) і рычажныя; паводле колькасці лічыльнікаў — адна- і шматлічыльнікавыя; паводле тыпу прыводу — ручныя і электрычныя.

Літ.: Соколов Я. В. Новейшие контрольно-кассовые аппараты и практика их применения, Л., 1968; Гутман Р. А. и Пашков Б. И. Контрольно-кассовые аппараты, их эксплуатация и ремонт, 2 изд., М., 1968.

КАНТРЫБУЦЫЯ (лац. contributio), 1) у час вайны прымусовыя грашовыя ці натуральныя паборы, што робяць захопнікі з насельніцтва акупаваных тэрыторый. 2) Грашовыя сумы, якія паводле ўмоў мірнага дагавору пераможаная краіна выплачвае краіне-пераможцы. СССР і інш. сацыяліст. краіны паслядоўна выступаюць супраць анексій і К.

КАНТУЗІЯ (лац. contusio удар), пашкоджанне тканак і органаў без парушэння цэласці скуры пры механічным уздзеянні сілы на пэўны ўчастак (мясцовая К.) або на ўсю паверхню (агульная К.) цела чалавека.

Мясцовая К. бывае ад удару цвёрдым прадметам ці ад падзення. Прыметы: боль, крывазліццё пад скуру (сіняк), прыпухласць. У цяжкіх выпадках могуць пашкоджвацца ўнутраныя органы. Лячэнне: спакой, холад, потым ціпло, пры неабходнасці хірург. аперацыі. Агульная К. (выбуховая, паветраная) — ад уздзеяння паветранай і выбуховай хвалі, абвалаў з пашкоджаннем цэнтр. і перыферычнай перв. сістэм, органаў пачуццяў і інш. Клініка як пры *струсе мозгу*: са стратай прытомнасці, паралічамі, расстройствамі адчувальнасці, мовы, рухомасці. Лячэнне: спакой, сардэчныя, дэгідратавальныя, болепатольныя і агульнаўмацавальныя сродкі. *І. П. Антонаў.* Мінск.

КАНТЫЛЕНА (італьян. cantilena), напеўная, лірычная мелодыя; пявучасць, меладычнасць музыкі, голасу, выканання.

КАНТЫНЕНТАЛЬНАЯ БЛАКАДА (франц. blocus continental), эканамічная палітыка, якую праводзіла ў 1806—14 напалеонаўская Францыя ў адносінах да Вялікабрытаніі.

Аб'яўлена дэкрэтам Напалеона I ад 21.11.1806 з мэтай зламаць супраціўленне Вялікабрытаніі ў барацьбе за гегемонію ў Еўропе і стварыць спрыяльныя ўмовы для развіцця франц. прамысловасці. Паводле дэкрэта, які пашыраўся на ўсіх саюзнікаў Францыі, забараняліся гандл., паштовыя і інш. зносіны з Брытанскімі а-вамі. Паводле *Тыльзіцкага міру 1807* да К. б. вымушана была далучыцца і Расія. К. б. адмоўна адбілася на эканоміцы большасці еўрап. краін (у т. л. Расіі, Даніі, Нідэрландаў і інш.), якія спецыялізаваліся на вывазе с.-г. прадукцыі і сыравіны на англ.

рынкі і атрымлівалі ўзамен бавоўну, прамысл. і калан. тавары. Гандаль Расіі і інш. краін з Вялікабрытаніяй вёўся кантрабандаю. Парушэнне К. б. з боку Расіі абвастрыла франка-рус. адносіны і было адной з прычын вайны 1812. К. б. афіц. скасавана ў крас. 1814 пасля крушэння напалеонаўскай імперыі.

Літ.: Тарле Е. В. Соч., т. 3 — Континентальная блокада, М., 1958.

КАНТЫНЕНТА́ЛЬНЫ КЛІ́МАТ, гл. ў арт. *Клімат.*

КАНТЫНЕНТА́ЛЬНЫЯ АДКЛА́ДЫ, адклады, якія ўтварыліся на сушы ці ва ўнутрымацерыковых вадаёмах.

Сярод К. а. вылучаюць адклады рэк і часовых водных патокаў (гл. *Алювій, Перлювій*), азёраў (гл. *Азёрныя адклады, Лімнагляцыяльныя адклады*), балотаў (гл. *Торф*), ледавікоў (гл. *Ледавіковыя адклады*), схілаў (гл. *Дэлювій, Пралювій, Калювій*), ветру (гл. *Эолавыя адклады*) і інш. Ад марскіх адрозніваюцца большай зменлівасцю саставу і нявытрыманасцю ў заляганні. К. а. змяшчаюць радовішчы вугалю, жалезных рудаў, кааліну, вогнетрывалых глінаў, буд. матэрыялаў, россыпы высакародных металаў і алмазаў.

Літ.: Шанцер Е. В. Очерки учения о генетических типах континентальных осадочных образований. М., 1966.

КАНТЫНЕ́НТЫ, тое, што *мацерыкі.*

КАНТЫ́НУУМ у матэматыцы (лац. continuum неперарыўны), тэрмін для абазначэння ўласцівасцей неперарыўнасці некат. мноства і для вызначэння магутнасці мностваў сапраўдных лікаў.

Найб. простае і вядомае неперарыўнае мноства — мноства ўсіх сапраўдных лікаў (лікавы К.) ці раўназначнае яму мноства ўсіх пунктаў прамой (лінейны К.). Уласцівасці неперарыўнасці гэтых мностваў апісваюцца рознымі аксіёмамі неперарыўнасці. Магутнасць мноства ўсіх сапраўдных лікаў наз. магутнасцю К. Даказваецца, што магутнасць лікаў на любым канечным адрэзку, а таксама магутнасць К. любой канечнай і нават лічыльнай колькасці вымярэнняў маюць магутнасць К. Найменшая з магутнасцей бесканечных мностваў — магутнасць лічыльнага мноства. Наступная за ёй вядомая магутнасць — магутнасць К. Задача вызначэння існавання прамежкавай магутнасці — праблема К. Гэта цяжкая матэм. праблема атрымала ў нядаўні час рашэнне ў сэнсе вызначэння таго, што дапушчальнасць існавання прамежкавай магутнасці сумяшчальная з астатнімі аксіёмамі *мностваў тэорыі.* Т. ч., могуць існаваць лагічна несупярэчлівыя тэорыі мностваў з дапушчальнасцю ці адмаўленнем мностваў прамежкавай магутнасці.

Літ.: Коэн П. Дж. Теория множеств и континуум-гипотеза. пер. с англ., М., 1969; гл. таксама літ. пры арт. *Мностваў тэорыя.*

Ф. Дз. Гахаў. Мінск.

КАНТЭ́ЙНЕР (англ. container ад contain змяшчаць), 1) рэзервуар, бак, прыёмнік (напр., для прадуктаў перагонкі нафты). 2) Шматабаротная тара для перавозкі бястарных грузаў на розных відах транспарту (водным, чыгуначным, бязрэйкавым).

К. бываюць універсальныя і спецыяльныя; закрытыя цэльныя, адкрытыя цэльныя, рашоткавыя, разборныя і складныя; кранавыя і бяскранавыя. Выкарыстанне К. паскарае пагрузачна-разгрузачныя аперацыі, абарот рухомага саставу транспарту, спрашчае сумесную работу розных відаў транспарту, захоўвае якасць грузаў, эканоміць выдаткі на тару і зніжае кошт транспартавання.

Літ.: Огурцов А. А. и др. Контейнеры. (Устройство, изготовление и ремонт), М., 1969; Ситник М. Д., Католиченко В. А. и Трихунков М. Ф. Контейнерные перевозки, М., 1970; Лазаретов В. Ф. и Люрье Г. С. Контейнерные перевозки в СССР и за рубежом. (Обзор), Мн., 1966.

КАНУН, традыцыйная яда на памінках, перад вячэраю. На Пд, ПдЗ Беларусі пякуць пшанічныя каржы. Кавалачкі іх кідаюць у засалоджаную мёдам ці цукрам ваду (сыту). У зах. і цэнтр. р-нах Беларусі вараць ячную ці з інш. круп кашу і падаюць з сытою.

КАНУРБА́ЦЫЯ (ад лац. con разам+urbs горад), група блізка размешчаных і цесна звязаных паміж сабой гарадоў. К. характэрны агульнасць эканам. жыцця, цесныя транспартныя сувязі, рэгулярныя паездкі жыхароў адных гарадоў К. на працу ў другія. К. з'яўляюцца амаль усе гарады з нас. больш за 1 млн. ж. з прыгарадамі, многія прамысловыя раёны.

К. ў сацыяліст. краінах развіваюцца планава, рост празмерна вялікіх гарадоў стрымліваецца. Тэрытарыяльнае расшырэнне гарадоў прыводзіць у некат. раёнах свету да збліжэння суседніх К. і ўтварэння гарадскіх агламерацый.

КАНФАРМА́ЦЫІ (позналац. conformis падобны), прасторавыя ізамеры, якія ўзнікаюць пры павароце атамаў ці груп атамаў у малекуле вакол простых сувязей і характарызуюцца наяўнасцю пэўнай колькасці энергіі. Прычына існавання К. — не зусім свабоднае (затарможанае) вярчэнне частак малекулы з-за ўзаемнага адштурхоўвання атамаў у прасторы, якое ўзнікае пры іх збліжэнні. Гл. таксама *Ізамерыя.*

КАНФАРМІ́СТЫ, прыхільнікі дзярж. царквы ў Англіі (гл. *Англіканская царква*), якія выступаюць супраць новаўвядзенняў.

КАНФЕДЭРА́ЦЫІ ў Рэчы Паспалітай, часовыя ваенна-палітычныя саюзы шляхты ў 16—18 ст.

Ва ўмовах аслаблення каралеўскай улады ўзніклі на т. зв. канвакацыйным сейме, які абвясціў сябе генеральнай К., вярхоўным органам улады. З 17 ст. генеральнымі К. называліся паліт. саюзы шляхты для абароны яе саслоўных інтарэсаў; існавалі таксама мясцовыя, ваяводскія К. Мелі свае сеймы, пастановы прымаліся большасцю галасоў. Часам К. аказвалі ўзброенае супраціўленне каралеўскай уладзе (рокаш). Найб. вядомыя *Віленская канфедэрацыя 1716, Барская канфедэрацыя, Таргавіцкая канфедэрацыя.* Адыгрывалі рэакц. ролю ў гісторыі Польшчы (перашкаджалі ажыццяўленню сац. ці адм. рэформаў).

КАНФЕДЭРА́ЦЫЯ (лац. confoederatio саюз, аб'яднанне), 1) пастаянны саюз суверэнных дзяржаў, аб'яднаных адным ці некалькімі агульнымі органамі, каб ажыццяўляць пэўныя мэты, пераважна знешнепалітычныя і ваенныя.

К. ў адрозненне ад *федэрацыі* — менш цеснае дзярж. аб'яднанне, не мае агульнай тэрыторыі, агульнага грамадзянства, фінансы складаюцца з узносаў дзяржаў, якія ў яе ўваходзяць. Рашэнні органаў К. звычайна павінны ратыфікавацца дзяржавамі — членамі К. Форма К. была пашырана ў перыяд станаўлення капіталізму. Найб. вядомыя К.: Швейцарскі саюз (1291—1798 і 1815—48), Нідэрланды (1579—1795), ЗША (1776—87), Германскі саюз (1815—66).

2) Саюз, аб'яднанне арг-цый або грамадскіх груп (напр., Усеагульная італьян. К. працы, К. працоўных Лац. Амерыкі, К. ў Рэчы Паспалітай).

КАНФЕРЭ́НЦЫІ КРАІ́Н, ЯКІ́Я НЕ ДАЛУ́ЧЫЛІСЯ, міжнар. нарады дзяржаў, якія не ўваходзяць у ваенна-паліт. групоўкі, што ўзніклі пасля 2-й сусв. вайны. Рашэнні канферэнцый аб'ектыўна абмяжоўваюць дзеянні агрэс. імперыял. колаў, спрыяюць умацаванню міру.

1-я канферэнцыя адбылася ў 1961 у Бялградзе (удзельнічалі кіраўнікі ўрадаў і дзяржаў 25 краін). Рашэнне пра яе скліканне прыняла Каірская нарада (1961), якая адбылася па ініцыятыве І. Брозціта, Г. А. Насэра, А. Сукарна, Дж. Нэру і ўрада Афганістана. Абмеркавала пытанні канчатковай ліквідацыі каланіялізму, усеагульнага і поўнага раззбраення, мірнага суіснавання дзяржаў з розным грамад.-паліт. ладам, ролі і будовы ААН і інш. Выказалася за актыўныя дзеянні на карысць міру, за вырашэнне мірным шляхам складаных міжнар. праблем, за канчатковую ліквідацыю сістэмы каланіялізму. Прыняла «Заяву аб пагрозе вайны і заклік да міру» і «Дэкларацыю кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў краін, якія не далучыліся». 2-я, Каірская, канферэнцыя 1964 кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў 57 краін прыняла Дэкларацыю «Праграма міру і міжнар. супрацоўніцтва», якая адзначае, што імперыялізм, каланіялізм і неакаланіялізм — асн. крыніца міжнар. напружанасці. Канферэнцыя патрабавала спыніць умяшанне імперыялістаў у справы народаў Конга, Кубы, Кіпра, краін Паўд.-Усх. Азіі, ліквідаваць замежныя ваен. базы на чужых тэр. Адной з асн. праблем сучаснасці прызнала праблему раззбраення, заклікала ўсе дзяржавы далучыцца да *Маскоўскага дагавору 1963*, выказалася за забарону ядзерных выпрабаванняў, за мірнае вырашэнне міжнар. спрэчак, за справядлівае і раўнапраўнае эканам. і культ. супрацоўніцтва паміж народамі. У 3-й канферэнцыі (1970, г. Лусака) удзельнічалі прадстаўнікі больш як 50 дзяржаў. У Дэкларацыі заявіла пра падтрымку міру ва ўсім свеце, абарону правоў народаў на самавызначэнне і незалежнасць, пра барацьбу супраць каланіялізму і расізму. Рэзалюцыя аб становішчы ў Паўд.-Усх. Азіі падтрымала вызв. барацьбу народаў Індакітая, патрабавала вывесці ўсе замежныя войскі з В'етнама. Рэзалюцыя па блізкаўсходняй праблеме патрабавала вываду ізраільскіх войск з арабскіх тэрыторый. Прыняла таксама рэзалюцыі пра становішча ў Паўд.-Афр. Рэспубліцы, Радэзіі, Намібіі, у партуг. калоніях; праграму садзеяння эканам. прагрэсу краін, якія развіваюцца.

КАНФЕРЭ́НЦЫІ НАРО́ДАЎ А́ФРЫКІ, перыядычныя з'езды прадстаўнікоў паліт. партый, прафс. і грамадскіх арг-цый афр. краін. Садзейнічалі актывізацыі і кансалідацыі барацьбы афр. народаў за незалежнасць, супраць каланіялізму і неакаланіялізму. Усяго адбылося 3 канферэнцыі.

1-я канферэнцыя (5—13.12.1958, Акра, удзельнічалі дэлегаты 27 краін) прыняла рашэнні па актывізацыі барацьбы за нац. незалежнасць. Дэкларацыя заклікала падтрымаць вызваленчую барацьбу залежных народаў Афрыкі, асудзіла імперыялізм і каланіялізм, патрабавала спыніць паліт. і эканам. эксплуатацыю афр. народаў імперыял. дзяржавамі. Канферэнцыя заганьбавала расізм, расавую сегрэгацыю, сістэму рэзервацый, прымусовую працу і палітыку апартэіду, заклікала афр. дзяржавы не падтрымліваць дыпламат. сувязей з расісцкімі дзяржавамі кантынента, падтрымала імкненне афр. народаў да адзінства, абвясціла канчатковай мэтаю стварэнне Саюза свабодных афр. дзяржаў. 2-я канферэнцыя (23—31.1.1960, Туніс, удзельнічалі дэлегаты больш як 30 краін) вызначыла праграму барацьбы афр. народаў супраць каланіялізму. Агульная рэзалюцыя запатрабавала ад каланізатараў тэрмінова пакінуць увесь афр. кантынент. Дэлегаты заклікалі ўсе незалежныя дзяржавы Афрыкі да адзінства дзеянняў у барацьбе, прапанавалі стварыць спец. орган па каардынацыі дапамогі і арганізацыі добраахвотных вайсковых часцей. Канферэнцыя прыняла рэзалюцыі па эканам. пытаннях. Рэзалюцыя аб развіцці прафс. руху падкрэсліла «асаблівую і вырашальную ролю рабочага класа ў барацьбе афр. народаў за незалежнасць і адзінства ўсяго кантынента, дэмакратыю і сацыяльны прагрэс». Канферэнцыя падтрымала барацьбу алжырскага народа за незалежнасць. 3-я канферэнцыя (25—30.3.1961, Каір, удзельнічалі дэлегаты 32 краін) прыняла рэзалюцыі па праблемах барацьбы афр. народаў за нац. незалежнасць, супраць неакаланіялізму. У рэзалюцыі аб афр. адзінстве вызначыла шляхі ўмацавання паліт. адзінства краін Афрыкі. Рэзалюцыя пра вызваленне залежных народаў заклікала афр. змагароў за свабоду нанесці канчатковы ўдар па імперыялізме і каланіялізме.

КАНФЕРЭ́НЦЫІ НЕЗАЛЕ́ЖНЫХ КРАІ́Н А́ФРЫКІ 1958—64, канферэнцыі кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў афр. краін для абмеркавання пытанняў і каардынацыі дзеянняў у барацьбе за канчатковую ліквідацыю каланіялізму і яго вынікаў у Афрыцы, за свабоду і незалежнасць афр. краін у эканам., паліт. і культурным развіцці і супрацоўніцтве, абарону нац. суверэнітэту.

Акрская канферэнцыя 1958 (удзельнічала 8 дзяржаў) у Дэкларацыі заявіла пра захаванне адзінства мэт і дзеянняў у міжнар. адносінах, абарону заваяванай незалежнасці, захаванне адзінства ў асн. пытаннях знешняй палітыкі. Прыняла таксама рэзалюцыю па праблемах міжнар. міру і супрацоўніцтва афр. дзяржаў у барацьбе за ліквідацыю каланіялізму ў Афрыцы, распрацавала практ. мерапрыемствы па эканам. і культ. супрацоўніцтве афр. дзяржаў і інш.

Манровійская канферэнцыя 1959 (9 краін) падтрымала вызв. вайну народа Алжыра, выказалася супраць франц. ядзерных выпрабаванняў у Сахары, асудзіла расавую дыскрымінацыю і сегрэгацыю, заклікала падтрымаць вызв. барацьбу народаў Уганды, Анголы, Паўн. Радэзіі.

Адыс-Абебская канферэнцыя 1960 (9 краін) прыняла рэзалюцыі па пытаннях нац.-вызв. руху афр. народаў. Заклікала знішчыць сістэму калан. панавання на кантыненце, прызнаць права алж. народа на самавызначэнне.

Касабланкская канферэнцыя 1961 прыняла т. зв. Касабланкскую хартыю, якая абвясціла імкненне краін-удзельніц да вызвалення кантынента ад замежнага панавання, вырашыла стварыць Кансультатыўную асамблею, Паліт., Эканам. к-ты, К-т па пытаннях культуры, Афр. аб'яднанае камандаванне. Прыняла рэзалюцыі па Алжыры, Конга, па пытанні ядзерных выпрабаванняў, пра падапечныя тэрыторыі.

Манровійская канферэнцыя 1961 (20 краін) прыняла рэзалюцыі «Аб сродках садзеяння ўзаемаразуменню і супрацоўніцтву для дасягнення адзінства краін Афрыкі і Малагасійскай Рэспублікі», што абвяшчала роўнасць усіх афр. дзяржаў і «Урэгуляванне канфліктаў, якія могуць узнікнуць паміж афр. дзяржавамі». У рэзалюцыі «Пагроза міру і стабільнасці ў Афрыцы і ва ўсім свеце» выказала намер краін-удзельніц падтрымліваць вызв. барацьбу афр. калоній.

Лагаская канферэнцыя 1962 (20 дзяржаў) прыняла рашэнне стварыць пастаянную арганізацыю афр. дзяржаў і Малагасійскай Рэспублікі, адзіны Пастаянны к-т міністраў па пытаннях фін. і эканам. супрацоўніцтва, а таксама супрацоўніцтва з «Агульным рынкам». Заклікала даць незалежнасць калан. краінам. Падтрымала барацьбу народа Анголы, асудзіла палітыку апартэіду ў ПАР.

Адыс-Абебская канферэнцыя 1963 (31 краіна) прыняла Хартыю афр. адзінства, каб умацаваць адзінства і салідарнасць афр. дзяржаў, каардынаваць і расшыраць іх супрацоўніцтва, абараняць суверэнітэт і інш. Вырашыла стварыць *Арганізацыю афрыканскага адзінства.* Прыняла рэзалюцыі па дэкаланізацыі, па апартэідзе і расавай дыскрымінацыі, па эканам. пытаннях, па ўсеагульным і поўным раззбраенні.

Каірская канферэнцыя 1964 (33 краіны) разгледзела пытанні канчатковай ліквідацыі каланіялізму ў Афрыцы, пытанні дапамогі вызв. руху ў калоніях і на залежных тэр. Афрыкі. Работу па ўзгадненні дзеянняў і развіцці ўсебаковага супрацоўніцтва афр. дзяржаў прадаўжае Арганізацыя афрыканскага адзінства.

КАНФЕРЭ́НЦЫЯ БЕЛАРУСКІХ СЕ́КЦЫЙ РКП(б), адбылася 21—23.12.1918 у Маскве. 19 дэлегатаў ад Петраградскай, Маскоўскай, Тамбоўскай і Саратаўскай секцый, створаных у крас.— вер. 1918 пры адпаведных райкомах і гаркомах РКП(б). Канфер. з'явілася першым крокам на шляху стварэння БССР. Яна прыняла прывітанні У. І. Леніну, ВЦВК, Вы-

шэйшаму Ваен.-Рэвалюц. Савету рэспублікі. У прывітанні ВЦВК выказана надзея на ажыццяўленне ідэі стварэння Сав. Беларусі.

Парадак дня: 1) Інфармацыя дэлегатаў пра паліт. работу на месцах. 2) Нац. пытанне (дакл. І. С. Няцецкі, З. Хв. Жылуновіч). 3) Сучаснае паліт. становішча на Беларусі і ўзаемаадносіны паміж паліт. партыямі. 4) Стварэнне Рабоча-сялянскага ўрада Беларусі. 5) Задачы беларускіх камуністаў. 6) Мабілізацыя беларускіх камуністаў. 7) Бягучыя справы.

Дакладчыкі па нац. пытанні памылкова спрабавалі давесці бясспрэчнасць бел. нацыі, даказаць, што бел. народ у сваёй масе земляробчы, дробнабуржуазны, што ён не падрыхтаваны ўспрыняць сацыялістычныя ідэі. Дэлегаты Б. Ю. Бяганскі і Я. А. Рыбак выступілі супраць такіх сцвярджэнняў і выказалі марксісцка-ленінскія погляды па нац. пытанні. Абмеркаванне паліт. становішча на Беларусі і ўзаемаадносін паміж паліт. партыямі паказала, што дэлегаты дрэнна ведалі канкрэтныя падзеі на акупаванай тэр. Беларусі, таму абмеркаванне гэтага пытання было адкладзена да часу, пакуль прыбудуць прадстаўнікі з Мінска. У выступленнях А. Р. Чарвякова і інш. дэлегатаў прызнавалася, што ўся паліт. і арганізатарская работа на акупаванай Беларусі вялася выключна падпольнымі парт. арг-цыямі пад кіраўніцтвам Паўн.-Зах. абкома РКП(б). Канфер. прызнала першачарговай задачай фарміраванне бел. палкоў Чырв. Арміі, а таксама неабходным накіраваць на Беларусь групу работнікаў для падрыхтоўкі Усебеларускага з'езду Саветаў. Прыняла рашэнні стварыць на Беларусі с.-г. камуны, мабілізаваць беларусаў-камуністаў для работы па Беларусі. Па даручэнні канферэнцыі Цэнтральнае бюро прыняло «Зварот да беларусаў», у якім заклікала працоўных Беларусі «ісці па вялікім шляху сацыялізма... Хутчэй жа ў дарогу, браты-беларусы! Але толькі з Савецкай Расіяй. На яе чырвоным сцягу гарыць заклік да пралетарскага аб'яднання, і беларусы толькі з ёю адной павінны дзяліць і радасць, і гора, бо не з каралёў жа і рэгенцкіх саветаў, тарыб і рад пачнём мы будаўніцтва новага савецкага жыцця ў Беларусі. Саветы рабочых, сялян і салдатаў — вось форма кіравання Беларусі...». Чл. Цэнтр. бюро бел. секцый РКП(б) выбраны З. Хв. Жылуновіч, Ф. Д. Балбека, І. С. Няцецкі, М. Ф. Дракo-Дракан, А. Р. Чарвякоў, канд. Я. Л. Дыла. Дэлегатамі на VI Паўн.-Зах. абл. канфер. РКП(б) [першы з'езд КП(б)Б] выбраны П. Г. Клыш, В. Г. Ханін, І. В. Лагун.

І. М. Ігнаценка. Мінск.

КАНФЕРЭНЦЫЯ ЕЎРАПЕЙСКІХ КАМУНІСТЫЧНЫХ І РАБОЧЫХ ПАРТЫЙ у Карлавых Варах (ЧССР), адбылася 24—26.4.1967 па пытанні бяспекі ў Еўропе. Удзельнічалі дэлегацыі камуніст. і рабочых партый Аўстрыі, Балгарыі, Бельгіі, Венгрыі, Вялікабрытаніі, ГДР, ФРГ, Зах. Берліна, Грэцыі, Данніі, Ірландыі, Паўн. Ірландыі, Іспаніі, Італіі, Кіпра, Люксембурга, Партугаліі, Польшчы, Сан-Марына, СССР, Фінляндыі, Францыі, Чэхаславакіі, Швейцарыі. Прысутнічаў прадстаўнік кампартыі Швецыі.

Канферэнцыя прыняла Заяву «За мір і бяспеку ў Еўропе», у якой пацвярджаецца правільнасць тэзіса камуністаў пра тое, што сусв. вайна не непазбежнай, што яе можна не дапусціць. На аснове навук. аналізу развіцця падзей у пасляваен. Еўропе ў Заяве выкладзена разгорнутая праграма дзеянняў усіх прагрэсіўных сіл за мір і бяспеку ў Еўропе, выказаны канкрэтныя прапановы для змяншэння напружанасці на кантыненце, для замены процілеглых ваенных блокаў сістэмай калектыўнай бяспекі. Канферэнцыя звярнулася да рабочага класа, сялянства, сярэдніх слаёў, інтэлігенцыі, да сацыялістаў і сацыял-дэмакр. партый, да прафсаюзаў Еўропы, да верующих усіх веравызнанняў, моладзі, жанчын, да ўсіх людзей добрай волі з заклікам аб'яднаць намаганні, каб даслягнуць агульнай мэты — міру. Канферэнцыя прыняла Зварот у падтрымку справядлівай барацьбы в'етнамскага народа, а таксама Заяву з выпадку падзей у Грэцыі, асудзіла ваенны пераварот у гэтай краіне, вроблены пры падтрымцы мілітарысцкіх колаў ЗША.

Публ.: Документы конференции европейских коммунистических и рабочих партий в Карловых Варах. 24—26 апр. 1967 г., М., 1967.

Э. М. Позняк. Мінск.

КАНФЕРЭНЦЫЯ ЗАМЕЖНЫХ СЕКЦЫЙ РСДРП 1915, адбылася 14—19 лют. (27 лют.—4 сак.) у Берне (Швейцарыя) пад кіраўніцтвам У. І. Леніна, мела значэнне агульнапартыйнай канферэнцыі.

Прысутнічалі прадстаўнікі ЦК партыі і ЦО, жаночай с.-д. арг-цыі, дэлегаты ад Парыжскай, Жэнеўскай, Бернскай, Цюрыхскай, Лазанскай, Лондонскай секцый замежнай арг-цыі РСДРП і бежыйскай групы. Асн. пытанне — вайна і задачы партыі. У дакладзе Леніна і прынятых канфер. рэзалюцыях вызначаны канкрэтныя шляхі ператварэння вайны імперыял. у вайну грамадзянскую. Канфер. адхіліла апартуніст. лінію кіраўніка бежыйскай групы Бухарына, які выступаў супраць ленінскіх лозунгаў аб вайне. У рэзалюцыях «Апартунізм і крах II Інтэрнацыянала», «III Інтэрнацыянал» раскрыты сап.-экапам. карэнні апартунізму, абгрунтавана неабходнасць поўнага арганізацыйнага размежавання з апартуністамі і стварэння новага Інтэрнацыянала. Канфер. выбрала новы склад к-та замежных арг-цый.

Літ.: КПСС в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК, т. 1, 8 изд., М., 1970.

У. У. Зубец. Мінск.

КАНФЕРЭНЦЫЯ КАМСАМОЛЬСКАЯ, вышэйшы кіраўнічы орган раённай, гарадской, акруговай, абласной, краявой камсамольскіх арг-цый; праводзіцца і ў вялікіх пярвічных камсамольскіх арг-цыях. На К. к. заслухоўваюцца справаздачы адпаведных к-таў камсамола, рэвіз. камісій, абмяркоўваюцца пытанні камсамольскай работы, выбіраюцца к-ты камсамола, рэвіз. камісіі і дэлегаты на К. к. вышэйстаячых камсамольскіх арг-цый, на з'езды ЛКСМ саюзных рэспублік, Усесаюзны з'езд камсамола. Перыядычнасць склікання і задачы К. к. вызначаны *Статутам ВЛКСМ.*

КАНФЕРЭНЦЫЯ КАМУНІСТЫЧНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ АКУПАВАНЫХ ГЕРМАНІЯЙ АБЛАСЦЕЙ, адбылася 19—24.10.1918 у Маскве. Прадстаўнікі: ад Беларусі, Украіны, Літвы, Латвіі, Эстоніі, Фінляндыі, Польшчы і акупаваных р-наў РСФСР.

Парадак дня: 1) Даклады: а) Цэнтр. бюро камуніст. арг-цый акупаваных мясцовасцей (Р. Расікас), б) прадстаўнікоў мясцовых бальшавіцкіх арг-цый (ад Беларусі І. Я. Алібегаў, А. М. Крыніцкі, ад Літвы В. С. Міцкявічус-Капсукас, З. І. Ангарэціс, ад Латвіі А. Берцэ-Арайс, К. К. Крастынь, ад Эстоніі Я. Х. Сіхвер, ад Польшчы С. Я. Бабінскі, ад Украіны Э. І. Квірынг, Я. А. Якаўлеў); 2) Бягучы момант, наша тактыка і лозунгі ў акупацыі (С. С. Пястковскі); 3) Арганіз. пытанні: а) падрыхтоўка да ўзбр. паўстання, б) мясцовыя арг-цыі і кіруючы цэнтр камуніст. арг-цый акупаванай тэр., в) ваен.-рэвалюц. арг-цыі ў аўстра-герм. войсках; 4) Выдавецкая дзейнасць; 5) Бягучыя справы. Выбары.

У. І. Ленін не змог прысутнічаць на канфер., але перадаў каштоўныя ўказанні, у т. л. пра неабходнасць улічваць канкрэтна-гістар. абставіны, лічыць Саветы найб. мэтазгоднай формай паліт. улады; пры адпаведных умовах ісці на часовы блок з дробнабурж. партыямі і нават на скліканне Устаноўчага сходу. Работай канфер. ад ЦК РКП(б) кіраваў Я. М. Свярдлоў. Ён ахарактарызаваў міжнар. і ўнутр. становішча Краіны Саветаў, падкрэсліў небяспеку з Пд, адзначыў рэвалюц. ўздым у Германіі і Аўстрыі, падкрэсліў, што парт. арг-цыі акупаваных тэр. павінны ўмацоўваць сувязь з ЦК РКП(б) і дзейнічаць з улікам агульнапарт. задач. У дакладзе ЦБ і ў дакладах з месцаў паказана становішча працоўных на акупаванай тэр., барацьба супраць ням. захопнікаў і бурж. нацыяналістаў. У асн. дакументе канфер.— «Тэзісах па бягучым моманце, нашай тактыцы і заклікаx» прааналізавана міжнар. і ўнутр. становішча, падкрэслена неабходнасць усебаковай падтрымкі Сав. Расіі — перадавога атрада сусв. рэвалюцыі, выкрываліся бурж. нацыяналісты як лакеі імперыялістаў. Гал. сродак барацьбы з інтэрвентамі — узбр. выступленні насельніцтва акупаванай тэр. пры апоры на Сав. Расію пад заклікамі «Няхай жывуць Саветы рабочых дэпутатаў!», «Няхай жыве Сав. Рэспубліка!». Канфер. прыняла рэзалюцыі пра падрыхтоўку ўзбр. паўстання, пра палітзняволеных, пра рабочых, вывезеных на прымусовыя работы ў Германію, па эканам. пытанні, пра неабходнасць рэвалюц. агітацыі ў герм. арміі для пашырэння ідэй братання і супрацоўніцтва з рэвалюц. салдатамі акупац. войск. У рэзалюцыі па нац. пытанні канфер. выкрывала дэмагогію герм. імперыялістаў пра «вызваленне» народаў, іх ілжывай прапагандзе процістаўляла бальшавіцкія заклікі да барацьбы працоўных усіх нацыянальнасцей супраць замежных і айч. прыгнятальнікаў, за свабоднае самавызначэнне на аснове салідарнасці з пралетарыятам Сав. Расіі і рэвалюц. Германіі. Канфер. рашыла стварыць пры ЦК РКП(б) *Цэнтральнае бюро камуністычных партый і арганізацый акупаваных абласцей* і намеціла яго задачы. Яна вызначыла кірунак дзейнасці і аб'яднала сілы парт. арг-цый акупаваных тэр., умацавала іх сувязь з ЦК РКП(б).

Літ.: КП(б)Б у рэзалюцыях, ч. 1 (1903—1921), Мн., 1934; Починин С. З. В грозовом восемнадцатом, Мн., 1969, с. 210—220.

С. З. Починін. Мінск.

КАНФЕРЭНЦЫЯ ПАРТЫЙНАЯ, вышэйшы кіраўнічы орган раённай, гарадской, акруговай, абласной, краявой, рэспубліканскай парт. арганізацый.

Перыядычнасць склікання і задачы К. п. вызначаны *Статутам КПСС.* У сваёй рабоце К. п. кіруецца пастановамі ЦК КПСС і ЦК камуніст. партыі адпаведнай саюзнай рэспублікі. К. п. заслухоўвае і абмяркоўвае справаздачы адпаведнага парт. к-та, рэвіз. камісіі, разглядае пытанні парт., гасп. і культурнага буд-ва, прымае рашэнні па абмеркаваных пытаннях, выбірае парт. к-т, рэвіз. камісію, дэлегатаў на парт. канферэнцыю вышэйстаячых органаў. Краявая і абласная К. п. выбіраюць дэлегатаў на з'езды кампартыі адпаведнай саюзнай рэспублікі і КПСС. Да XIX з'езду КПСС (1952) Статут прадугледжваў правядзенне паміж з'ездамі ўсесаюзных К. п. (праведзена 18) для абмеркавання тэрміновых пытанняў парт. палітыкі. XIX з'езд КПСС адмяніў скліканне ўсесаюзных канферэнцый і вырашыў усе пытанні абмяркоўваць на з'ездах і Пленумах ЦК КПСС. Паводле рашэння XXIII з'езду КПСС (1966) Статут КПСС прадугледжвае, што па меры неабходнасці ЦК КПСС можа склікаць паміж з'ездамі саюзных К. п., ЦК кампартый саюзных рэспублік — К. п. рэспубліканскія. Парадак правядзення Усесаюзнай К. п. вызначае ЦК КПСС, рэспубліканскіх — ЦК кампартый саюзнай рэспублікі.

КАНФЕРЭНЦЫЯ ПРАПАГАНДЫСТАЎ АРГАНІЗАЦЫЙ РСДРП ПАЎНОЧНА-ЗАХОДНЯГА КРАЮ, адбылася ў канцы верасня — пач. кастр. 1905 у Мінску. Прысутнічалі прадстаўнікі Паўн.-Зах. саюза, Мінскай, Бабруйскай, Віцебскай, Віленскай арг-цый, Смаленскага к-та РСДРП і адказны прапагандыст ЦК РСДРП.

Парадак дня: 1) Справаздачы дэлегатаў пра стан прапаганды на месцах; 2) Даклад адказнага прапагандыста ЦК; 3) Розныя пытанні і паведамленні.

Канфер. прыняла рэзалюцыю пра пастаноўку парт. прапаганды і агітацыі, прапанаваную калегіяй прапагандыстаў пры Мінскай арг-цыі РСДРП; распрацавала формы парт. агітацыі і прапаганды: 1) масоўкі для растлумачэння заклікаў РСДРП «Далоў самадзяржажаўе!», «Няхай жыве дэмакр. рэспубліка!» і інш.; 2) лятучкі ніжэйшага тыпу (3—4 лекцыі) для азнаямлення рабочых з праграмай РСДРП; 3) гурткі ніжэйшага тыпу (7 лекцый) і 4) гурткі вышэйшага тыпу (18—20 лекцый) для падрыхтоўкі прапагандыстаў з рабочых. Канфер. пастанавіла прасіць ЦК выдаваць брашуры і публікаваць у ЦО артыкулы, якія выкрывалі б нацыяналіст. партыі Паўн.-Зах. краю; паставіла перад арг-цыямі РСДРП Паўн.-Зах. краю задачу палепшыць парт. прапаганду і агітацыю, а таксама паліт. работу сярод працоўных, каб мабілізаваць іх на звяржэнне самадзяржаўя.

Літ.: Партия в революции 1905 года, М., 1934, с. 232—237; Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 1, 2 изд., Мн., 1968, с. 125—127.

М. Я. Шкляр. Мінск.

КАНФЕРЭНЦЫЯ ФРАНТАВЫХ І ТЫЛАВЫХ ВАЕННЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ РСДРП(б), адбылася 16—23.6(29.6—6.7).1917 у Петраградзе. Склікана Аргбюро Ваеннай арг-цыі пры ЦК РСДРП(б). Прысутнічала 160 дэлегатаў 43 франтавых і 17 тылавых ваен. бальшавіцкіх арг-цый ад 26 тыс. чл. партыі.

Парадак дня: 1) Даклады з месцаў; 2) Адносіны да рэзалюцыі VII (Красавіцкай) Усерас. канфер. РСДРП(б) (Р. Я. Зіноўеў); 3) Бягучы момант — арганізацыя ўлады і Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў (У. І. Ленін); 4) Вайна, мір, наступленне (М. В. Крыленка. А. Ф. Разміровіч); 5) Нац. рух і нац. палкі (І. В. Сталін); 6) Дэмакратызацыя арміі (М. В. Крыленка); 7) Мэты, задачы і форма ваен. арг-цыі (М. І. Падвойскі, У. І. Неўскі, С. А. Чарапанаў); 8) Аграрнае пытанне (У. І. Ленін); 9) Агульнарасійская салдацкая і сялянская газета (У. І. Неўскі); 10) Усеагульнае ўзбраенне народа (П. В. Дашкевіч); 11) Выбары.

У. І. Ленін вызначыў задачы бальшавікоў у падрыхтоўцы пралетарыяту і арміі ў пера-

ходзе ўлады да Саветаў. Канферэнцыя адзначыла неабходнасць прадаўжаць агітацыю супраць імперыял. вайны, прыпыніць спробы контррэвалюцыі разбіць рэвалюц. рабочых, змагацца супраць анархісцкіх настрояў, рыхтаваць сілы пралетарыяту і арміі да новага сацыяліст. этапу рэвалюцыі. Па агр. пытанні канферэнцыя прыняла рэзалюцыю VII (Красавіцкай) канферэнцыі РСДРП(б). Сярод тых, хто выступіў з дакладамі з месца, былі дэлегаты Зах. фронту Легес і Слюсарэнка. У рэзалюцыях канферэнцыі выказаны погляды бальшавікоў па пытаннях вайны, міру, наступлення, усеагульнага ўзбраення народа, дэмакратызацыі арміі і па нац. пытанні. Газ. «Солдатская правда» прызнана цэнтр. органам ваен. арг-цыі РСДРП(б). Зацверджаны праект статута ваен. арг-цыі і выбрана Усерас. цэнтр. бюро ваен. арг-цыі пры ЦК РСДРП(б) у складзе М. І. Падвойскага, М. В. Крыленкі, М. С. Кедрава, У. І. Неўскага, К. А. Механошына, П. В. Дашкевіча і інш.

Літ.: Ленін У. І. Даклад аб сучасным моманце на Усерасійскай канферэнцыі франтавых і тылавых ваенных арганізацый РСДРП(б) 20 чэрвеня (3 ліпеня) 1917 г., Тв., т. 41 (Полн. собр. соч., т. 32); КПСС у рэзалюцыях і рашэннях з'ездаў, канферэнцый і пленумаў ЦК, ч. 1, Мн., 1954; Голуб П. А. Партия, армия и революция, М., 1967. *У. П. Верхась.* Гродна.

КАНФІСКАЦЫЯ (лац. confiscatio адабранне ў казну), беззваротнае і прымусовае адабранне маёмасці ва ўласнасць дзяржавы.

У СССР ужываецца паводле прыгавору суда як мера пакарання ў адпаведнасці з крымін. кодэксамі саюзных рэспублік. У асобных выпадках дазваляецца як адміністрацыйная мера (канфіскуюцца кантрабандныя тавары). Бывае поўная і частковая. Пасля Кастр. рэв. канфіскаваны ва ўсенароднаю сацыяліст. ўласнасць сродкі вытворчасці ў рус. і замежнай буржуазіі, маёмасць у памешчыкаў, купцоў, чыноўнікаў і інш. эксплуататараў. К. праводзілася як рэпрэсіўная мера Сав. дзяржавы супраць капіталістаў, якія ігнаравалі ці парушалі дэкрэты і распараджэнні Сав. улады. Шырока выкарыстоўвалася імперыял. дзяржавамі ў калан. і залежных краінах для рабавання прыгнечаных народаў. У час агульнага крызісу капіталізму і распаду калан. сістэмы прагрэс. ўрады маладых нац. дзяржаў праводзяць К. сродкаў вытворчасці, зямлі, маёмасці, якія раней належалі замежнаму капіталу і нац. буржуазіі.

КАНФУЦЫЯНСТВА, адзін з найбольш пашыраных кірункаў грамадскай думкі ў старажытным Кітаі. Разам з *будызмам* і даоскай рэлігіяй доўгі час было пануючай ідэалогіяй феад. Кітая. Засн. К.— кіт. мысліцель Канфуцый (551—479 да н. э.). Паводле яго вучэння лёс чалавека вызначаецца «небам» і людзі не могуць змяніць існуючага парадку. Тэарэт. аснова этыкі К.— вучэнне пра адпаведнасць імёнаў сутнасці рэчаў.

У развіцці К. значна эвалюцыянавала. Аднак асн. яго мэта — усхваленне «нябеснай волі», ахова грамадскага ладу, які існуе, ад усялякіх змен, абарона прывілеяванага становішча пануючых класаў. Гэтыя прынцыпы ляглі ў аснову стварэння Дуи Чжун-шу (2 ст. да н. э.) канфуцыянскай артадаксальнай дактрыны. Канфуцый быў аб'яўлены святым, заснавальнікам рэлігіі, тэалагізаванае К. стала пануючай ідэалогіяй Кітая з 2 ст. да н. э. да 2 ст. н. э. Падрыву веры ў канапічнасць вучэння К. садзейнічала школа стараж. тэкстаў, прыхільнікі якой даказвалі, што афіц. К. (школа сучасных тэкстаў) адышло ад асн. прынцыпаў Канфуцыя. З 10 ст. н. э. ў К. па першы план выступае повал плынь — неаканфуцыянства. Найб. уплывовай у неаканфуцыянстве была філас. сістэма Чжу Сі, ведаць якую было абавязкова усім чыноўнікам Кітая. Ідэалогія К., глыбока ўкаранёная ў свядомасць кіт. народа, перашкаджала і перашкаджае сац. прагрэсу. Пасля перамогі рэвалюцыі 1949 уплыў К. на грамадска-паліт. жыццё Кітая значна паменшыўся. Аднак некат. рысы К., асабліва культ продкаў, і ў наш час уплываюць на пэўныя колы насельніцтва краіны.

Літ.: История философии, т. 1, М., 1957; Александров Г. Ф. История социологических учений. Древний Восток, М., 1959. *М. І. Іоська.* Мінск.

КАНХОІДА некаторай плоскай лініі *L* (ад грэч. konchoeidēs падобны на ракавіну), крывая, якая атрымліваецца пры павелічэнні ці памяншэнні кожнага радыус-вектара крывой *L* на адну і тую ж велічыню *d*.



К. прамой наз. К. Нікамеда. У залежнасці ад суадносін *l* і *d*, дзе *l* — адлегласць ад пачатку каардынат да прамой *L*, К. Нікамеда мае розную форму (гл. рыс). Абедзве галіны К. асімптатычна набліжаюцца да прамой у абодвух напрамках. К. акружнасці, што праходзіць праз пачатак каардынат, наз. завіткай Паскаля.

Літ.: Савелов А. А. Плоские кривые, М., 1960.

КАНЦАВАЯ МАРЭНА, абломкавы матэрыял, які намнажаецца дугападобнымі градамі каля ніжняга канца горнага ці каля краю мацерыковага ледавіка пры яго працяглым стацыянарным становішчы.

Паводле спосабу ўтварэння вылучаюць К. м. насыпныя (акумулятыўныя), напорныя і мяшаныя. Першыя ўтвараюцца ад раставання ледавіка і разгрузкі каля яго краю змешчанага ў ім матэрыялу (гл. *Марэна*); другія — ад дынамічнага дзеяння краю ледавіка на горныя пароды перад ім. Напорныя марэны звычайна змятыя, са складкавасцю (гл. *Гляцыдыслакацыя*). На Беларусі К. м. ўтвараюць асобныя формы рэльефу — грады ці ланцугі ўзгоркаў, выцягнутых пераважна з З на У (гл. *Марэнны рэльеф*). Літалагічны састаў парод, якія складаюць К. м., вельмі разнастайны: суглінкі і супескі перамяжаюцца з пяскамі, жвірам, галькай і валунамі. У БССР К. м. пашыраны ў межах Свіцянскіх, Ашмянскіх град, Гродзенскага ўзвышша, Мазырскай грады і інш. Канцавыя марэнныя пасы абледзянення антрапагенавага перыяду асталіся таксама ў рэспубліках Прыбалтыкі, у Польшчы, ГДР, ФРГ, Швецыі, Фінляндыі, Канадзе, ЗША.

КАНЦАЎ Георгій Фёдаравіч (н. 7.4.1907, с. Яманхалінка Гур'еўскага пав. Уральскай вобл.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1943. На фронце з 1941, старшына, парторг роты. Вызначыўся пры вызваленні Бабруйска. 28.6.1944 першы з роты ўварваўся ў горад, а калі выбыў са строю камандзір, К. узначаліў роту і тры дні кіраваў боем. За гэты час рота знішчыла 200 гітлераўцаў і 104 узяла ў палон. Жыве ў пас. Махамбет Гур'еўскай вобл.

КАНЦЛЕР (ням. Kanzler ад позналац. cancellarius пісар), 1) у Вялікім княстве Літоўскім — начальнік канцылярыі вялікага князя, хавальнік вялікай дзярж. пячаткі, член паноў-рады.

Пасада К. уведзена ў 15 ст. Назначаўся пажыццёва з феад. знаці. Дакладваў князю і радзе пра дзярж. справы, рэдагаваў статуты і рашэнні рады, змацоўваў афіц. дакументы пячаткай і падпісваў іх (мог адмовіць у гэтым, калі дакумент супярэчыў законам), вёў перагаворы з замежнымі дзяржавамі, захоўваў копіі дзярж. дакументаў. Пасля Люблінскай уніі 1569 — член сената Рэчы Паспалітай; займаўся замежнымі справамі разам з каронным (польскім) К. Лічыўся другім пасля *маршалка* міністрам. У якасці жалавання атрымліваў ад караля староства. Займаў інш. кіруючыя пасады (ваявода віленскі, *гетман*). К. Вял. кн. Літ.: Федка Каэлоўскі [1445—46], Міхал Кежгайлавіч [1446—76], Алехна Судзімантавіч [1477—90], Мікалай Радзівілавіч [1492—1509], Мікалай Мікалаевіч Радзівіл [1510—22], Альбрэхт Марцінавіч Гаштольд [1522—39], Ян Юр'евіч Глябовіч [1546—49], Мікалай Янавіч Радзівіл [1550—65], Мікалай Юр'евіч Радзівіл [1566—79], Астафі Валовіч [1579—87], Крыштоф Радзівіл [1587—88], Леў Сапега [1589—1623], Альбрэхт Станіслаў Радзівіл [1623—56], Крыштоф Пац [1658—84], Марцыян Агінскі [1684—90], Дамінік Радзівіл [1690—97], Караль Станіслаў Радзівіл [1698—1719], Міхал Вішнявецкі [1720—35], Ян Фрыдэрык Сапега [1735—51], Фрыдэрык Міхал Чартарыйскі [1752—75], Аляксандр Міхал Сапега [1775—93], Іаахім Літавар-Храптовіч [1793—95].

2) У царскай Расіі — найвышэйшы грамадзянскі чын, уведзены Пятром I у 1709. 3) У Швейцарыі — сакратар Савета палаты парламента. 4) У Германіі (1871—1945) рэйхсканцлер — прэм'ер-міністр. 5) У Вялікабрытаніі К. казначэйства — міністр фінансаў; лорд-К.— старшыня палаты лордаў. 6) У Аўстрыі і ў ФРГ федэральны К.— кіраўнік урада.

Літ.: Wolff J. Senatorowie i dygnitarze Wielkiego księstwa Litewskiego, Kraków, 1885.
А. П. Грыцкевіч. Мінск.

КАНЦОНА (італьян. canzone), 1) свецкая шматгалосая песня эпохі Адраджэння, блізкая простым складам да народнай. 2) Інстр. п'еса імітацыйна-поліфанічнага складу, падобная да рычэркара або фугі (16—17 ст.). 3) Сольная песня з інстр. суправаджэннем. Узнікла з усталяваннем гамафоннага складу. К. 19—20 ст.— вак. і інстр. п'есы з напеўнай мелодыяй.

КАНЦЭНТРАВАНЫЯ КАРМЫ (канцэнтраты), кармы, у якіх многа пажыўных рэчываў (не менш як 0,65 кармавой адзінкі на 1 *кг*). Маюць мала клятчаткі, добра ператраўляюцца жывёлаю, павялічваюць агульную і бялковую пажыўнасць рацыёнаў. Асн. кампанент для вытворчасці *камбікармоў*.

К. к. падзяляюцца на вугляводзістыя (60—70% крухмалу) і пратэінавыя (20—65% пратэіну). Вугляводзістыя — зерне злакаў (авёс, ячмень, кукуруза, жыта, пшаніца, проса, сорга і інш.); пратэінавыя — зерне бабовых (гарох, боб, лубін, віка, сачавіца і інш.), адходы тэхн. вытворчасці (макуха, сухія жамерыны, вотруб'е, мелес, брага, соладавыя парасткі, піўныя і кармавыя дрожджы і інш.), кармы жывёльнага паходжання (рыбнай, мясная, крывяная мука, сухі адгон, казеін і інш.). Перад скормліваннем К. к. крышаць, дранджыруюць, размолваюць, запарваюць, каб лепей засвойваліся пажыўныя рэчывы.

Літ.: Справочник по производству и использованию кормов, 2 изд., Мн., 1968; Дмитроченко А. П. Кормление сельскохозяйственных животных, М.— Л., 1956. *Ю. С. Шкункова.* Жодзіна.

КАНЦЭНТРАТ [ад лац. con (cum) разам+ +centrum цэнтр], 1) рэчыва, ачышчанае ад пабочных дамешак, адабранае і ўшчыльненае. 2) У горнай справе і металургіі — прадукт абагачэння карысных выкапняў, прызначаны для далейшай перапрацоўкі. Найб. пашыраны К. металічных рудаў, якія перапрацоўваюцца на металург. заводах. 3) К. харчовыя — абязводжаныя брыкетаваныя харч. прадукты і паўфабрыкаты, якія зручна хаваць і з якіх можна хутка прыгатаваць страву. 4) Высокакаларыйны корм жывёле (гл. *Канцэнтраваныя кармы*).

КАНЦЭНТРАЦЫЙНЫЯ ЛАГЕРЫ, спец. месцы зняволення барацьбітоў за дэмакратыю і сацыялізм у капіталіст. краінах, ваеннапалонных і грамадзян, пасаджаных без суда на няпэўны час.

Упершыню створаны англічанамі ў англа-бурскую вайну ў пач 20 ст. Пашыраны ў 1-ю сусв. вайну, пазней у краінах з фашысцкім рэжымам: Іспаніі, Італіі, бурж. Польшчы (гл. *Бяроза-Картузскі канцэнтрацыйны лагер*) і інш. Найб. люта сістэма з крывавым тэрорам і масавымі забойствамі ўведзена ў К. л. гітлераўскай Германіі, дзе спец. дэкрэтам «Пра абарону народа і дзяржавы» (1933) ліквідаваны грамадз. правы і прадугледжана прэвентыўнае (папераджальнае, засцерагальнае) зняволенне. За кароткі час знішчаны дзесяткі тысяч камуністаў, патрыётаў-антыфашыстаў, прафс. дзеячаў. Ням.-фаш. захопнікі на акупаваных тэрыторыях у 1939—45 стварылі сістэму К. л., якія ператварылі ў камбінаты смерці з газавымі камерамі, крэматорыямі, душагубкамі. Жахлівымі месцамі знішчэння людзей былі К. л. *Асвенцім, Дахау, Бухенвальд, Майданак, Майтгаўзен, Равенсбрук, Заксенгаўзен* і інш. На часова акупаванай тэр. СССР, у т. л. і на Беларусі, ням.-фаш. захопнікі стварылі ў кожным р-не лагеры смерці, лагеры ваеннапалонных, «працоўныя выхаваўчыя лагеры», перасыльныя, гета і інш. Месцамі масавага знішчэння на Беларусі былі К. л. ў Азарычах, Бабруйску, Бераэвеччы, Калдычэве, Калбасіне, Лупалаве, Лясной, Маладзечне, Масюкоўшчыне, Трасцянцы і інш. (гл. адпаведныя арт. пад назвай, напр. *Азарычскі лагер смерці*, а таксама *Акупацыйны рэжым*). Пасля 2-й сусв. вайны рэакц. правячыя колы стварылі К. л. ў Паўднёвай Карэі, Паўднёвым В'етнаме, Грэцыі, Партугаліі і інш. краінах.

Літ.: Нюрнбергский процесс над главными немецкими военными преступниками. Сб. материалов, т. 1—3, М., 1965—66; Люди, победившие смерть. Воспоминания бывших узников фашистских лагерей, Л., 1968; В фашистских застенках. Записки, Мн., 1961; Бухенвальд. Документы и сообщения, пер. с нем., М., 1962; СС в действии. Документы о преступлениях СС, пер. с нем., М., 1968. *В. С. Лазебнікаў.* Мінск.

КАНЦЭНТРАЦЫЯ ВЫТВОРЧАСЦІ, засяроджванне вытворчасці на ўсё больш буйных прадпрыемствах. Аб'ектыўная заканамернасць развіцця прадукцыйных сіл. Характарызуецца ростам удзельнай вагі вял. прадпрыемстваў у агульнай вытворчасці прадукцыі адпаведнай галіны. Абумоўлівае каапераванне і камбінаванне, спецыялізацыю і інтэнсіфікацыю вытворчасці, павышае яе эфектыўнасць.

Пры капіталізме К. в. адбываецца стыхійна, у канкурэнтнай барацьбе, у якой буйныя прадпрыемцы перамагаюць дробных і, каб атрымаць большы прыбытак, расшыраюць маштабы вытворчасці. Стымулюецца канцэнтрацыяй і цэнтралізацыяй капіталу. Узмацняецца ў перыяд эканам. крызісаў і войнаў, садзейнічае перарастанню капіталізму свабоднай канкурэнцыі ў імперыялізм. Створаныя пры гэтым манаполіі яшчэ больш паскараюць канцэнтрацыю вытворчасці. Узмацняецца эксплуатацыя працоўных, абвастраецца асноўная супярэчнасць капіталізму. Пры сацыялізме К. в. заснавана на грамадскай уласнасці на сродкі вытворчасці і планавым вядзенні нар. гаспадаркі, што забяспечвае больш высокія тэмпы К. в., чым пры капіталізме. СССР па ўзроўні К. в. ў прамысловасці займае першае месца ў свеце. Адзін з галоўных шляхоў К. в. ў СССР — *вытворчыя аб'яднанні*. У БССР (1970) было больш за 30 такіх аб'яднанняў, якія выпусцілі 10% прамысл. прадукцыі рэспублікі. Умовы для К. в. ў сельскай гасп. СССР створаны пераходам да калект. формаў гаспадарання. Мае міжгасп. і ўнутрыгасп. кірунак. Міжгасп. К. в. адбываецца праз стварэнне вял. спецыялізаваных прадпрыемстваў па вытворчасці малака і рэпра-

дукцыі маладняку, адкорму буйн. раг. жывёлы і свіней, вытворчасці агародніны і бульбы. Пашыраецца буд-ва дзярж. жывёлагадоўчых комплексаў па вытворчасці прадуктаў с. гасп. на прамысл. аснове, узнікаюць аграпрамысл. комплексы. Унутрыгасп. К. в. накіравана на стварэнне буйных спецыялізаваных жывёлагадоўчых фермаў. Разам з вял. прадпрыемствамі ў СССР існуюць і развіваюцца сярэднія і невялікія, аснашчаныя сучаснай тэхнікай.

Літ.: Маркс К. Капітал, т. 1, Мн., 1952; Ленін У. І. Развіццё капіталізму ў Расіі, Тв., т. 3 (Полн. собр. соч., т. 3); яго ж. Імперыялізм, як вышэйшая стадыя капіталізму, Тв., т. 22 (Полн. собр. соч., т. 27); Касыгін А. М. Дырэктывы XXIV з'езда КПСС па пяцігадоваму плану развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1971—1975 гады, Мн., 1971; Праграма Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Мн., 1961, ч. 1; Белорусская ССР за годы Советской власти, Мн., 1967; Сачко Н. С. Концентрация производства в промышленности, М., 1968; Забелин Б. М. Концентрация и специализация промышленности в условиях реформы, М., 1970. *В. Р. Крастоўскі, В. С. Маўрышчаў.* Мінск.

КАНЦЭНТРА́ЦЫЯ І ЦЭНТРАЛІЗА́ЦЫЯ КАПІТА́ЛУ, павелічэнне памераў капіталу: пры канцэнтрацыі — накапленнем прыбавачнай вартасці, ператварэннем яе ў капітал; пры цэнтралізацыі — аб'яднаннем некалькіх капіталаў у адзін ці паглынаннем аднаго капіталу другім. Абумоўлены законамі капіталіст. развіцця і ўзаемазвязаны. Канцэнтрацыя капіталу — аснова цэнтралізацыі: чым большая канцэнтрацыя капіталу ў буйных капіталістаў, тым яны мацнейшыя ў канкурэнтнай барацьбе і хутчэй перамагаюць слабых прадпрыемцаў. Апошнія бяднеюць, іх капітал трапляе ў рукі буйных прадпрыемцаў, адбываецца цэнтралізацыя капіталу. У сваю чаргу, цэнтралізацыя капіталу садзейнічае яго канцэнтрацыі, бо там, дзе большы капітал, большыя і памеры яго накаплення. К. і ц. к. абвастраюць супярэчнасць паміж працай і капіталам, паглыбляюць падзел грамадства на два полюсы — багацця, засяроджанага ў руках кучкі мільянераў, і беднасці працоўных.

Канцэнтрацыя капіталу паскарае развіццё тэхнікі, садзейнічае росту *арганічнай будовы капіталу*, абумоўлівае тэндэнцыю нормы прыбытку да зніжэння. Падзенне нормы прыбытку капіталісты імкнуцца кампенсаваць за кошт павелічэння масы прыбытку нарошчваннем свайго капіталу, расшырэннем вытворчасці, узмацненнем ступені эксплуатацыі. Адноснае скарачэнне долі пераменнага капіталу вядзе да ўтварэння рэзервовай арміі беспрацоўных. Цэнтралізацыя капіталу выражае пераважна адносіны паміж капіталістамі, азначае пераразмеркаванне паміж імі накопленых капіталаў. Паскараюць цэнтралізацыю капіталу канкурэнтная барацьба і развіццё капіталіст. крэдыту. Адна з формаў цэнтралізацыі капіталу — *акцыянерныя таварыствы*. На аснове К. і ц. к. адбываецца *канцэнтрацыя вытворчасці*. У апошняй трэці 19 ст. гэтыя працэсы прывялі да ўзнікнення *манаполій*, перарастання капіталізму свабоднай канкурэнцыі ў імперыялізм. Манаполіі яшчэ больш павялічваюць маштабы К. і ц. к. У ЗША ад 60 да 90% прамысл. вытворчасці ў кожнай галіне засяроджана ў руках 3—4 найбуйнейшых манаполій. Побач з К. і ц. к. ў прамысловасці адбываецца канцэнтрацыя банкаўскага капіталу, зрошчванне банкаўскіх манаполій з прамысловымі, утвараецца *фінансавы капітал* і *алігархія фінансавая*, якія непадзельна пануюць у эканоміцы і палітыцы імперыял. дзяржаў.

Літ.: Маркс К. Капітал, т. 1, Мн., 1952, раздз. 23, 24; Ленін У. І. Імперыялізм, як вышэйшая стадыя капіталізму, Тв., т. 22, раздз. 1 (Полн. собр. соч., т. 27, гл. 1); Новые явления в накоплении капитала в империалистических странах, М., 1967; Микша Л. С. Новое в современном перенакоплении капитала США, М., 1970; Роговский И. Т. Концентрация производства и монополии. Финансовый капитал и финансовая олигархия, Мн., 1970. *У. І. Мазур.* Мінск.

КАНЦЭ́ПЦЫЯ (лац. conceptio разуменне, сістэма), сістэма поглядаў, прынцыпаў у якой-н. галіне; агульны замысел, асн. ідэя твора, працы.

КАНЦЭ́РАВА, вёска ў Язненскім с/с Міёрскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр саўгаса «Юбілейны». За 70 *км* на ПдУ ад Міёраў, 150 *км* ад Віцебска, 20 *км* ад чыг. ст. Загацце. 236 ж., двароў 75 (1971). Пач. школа, аддз. сувязі, магазін.

КАНЦЭРАГЕ́ННЫЯ РЭ́ЧЫВЫ (лац. cancer рак+грэч. génos паходжанне, нараджэнне), бластамагенныя рэчывы, канцэрагены, рэчывы, якія маюць здольнасць выклікаць утварэнне злаякасных і інш. пухлін (гл. *Пухліны*).

Першае К. р.— 3,4-бензпірэн — вылучана з каменнавугальнай смалы (1933), пазней з прадуктаў няпоўнага згарання кам. вугалю, нафты, тытуню. К. р. знойдзены ў злучэннях розных класаў (акрыдзінавыя фарбавальнікі, амінаазазлучэнні, флуарэны, нафтыламін, урэтан), у неарганічных солях мыш'яку, берылію, хрому, у рэчывах, якія ўтвараюцца ў арганізме ад парушэння абмену (эндагенныя канцэрагены). Канцэрагенныя ўласцівасці маюць рэнтгенаўскія прамяні, ядзерныя выпрамяненні, вірусы, паразіты. Паяўленне пухлін і іх асаблівасці залежаць ад якасці і дозы К. р., працягласці іх уплыву і стану рэактыўнасці арганізма.

Літ.: Зильбер Л. А. и Абелев Г. И. Вирусология и иммунология рака, М., 1962; Современные проблемы онкологии, Л., 1967 (бібліягр.); Шабад Л. М. Эндогенные бластомогенные вещества, М., 1969; яго ж. Методы определения и изучения бластомогенности химических веществ, М., 1970. *І. П. Сяржанін.* Мінск.

КАНЦЭ́РН (англ. concern), адна з формаў манапалістычных аб'яднанняў, саюз цесна звязаных паміж сабою прадпрыемстваў, якія фармальна маюць самастойнасць, але фактычна падпарадкоўваюцца пануючай групе фінансава-прамысловых магнатаў.

У К. аб'ядноўваюцца прадпрыемствы прамысловасці, транспарту, гандлёвыя, банкавыя і страхавыя фірмы, каб атрымаць найбольшы прыбытак. Як і інш. аб'яднанні (гл. *Трэст, Картэль*), з'яўляюцца характэрнай рысай імперыялізму. У К. наглядна выяўляецца зрошчванне банкаўскага і прамысл. капіталу, дасягаецца высокі ўзровень канцэнтрацыі вытворчасці і капіталу. Асн. ядром К. звычайна з'яўляецца найб. моцная прамысл. кампанія (герм. К. Крупа), вялікі банк (амер. К. Моргана), сямейная фірма (яп. К. Міцуі) або спецыяльна створаныя галаўныя т-вы ці т-вы-холдзінгі, у якіх сканцэнтраваны партфелі акцый асн. кампаній. Найб. вялікія К. кантралююць друк, радыё, кіно, навуку, шырока выкарыстоўваюць іх у інтарэсах нажывы і мілітарызму.

КАНЦЭ́РТ (ад лац. concerto спаборнічаю), 1) публічнае выкананне муз. твораў па загадзя складзенай праграме. 2) Віртуозны твор для аднаго, радзей двух, трох інструментаў і аркестра. У аснове муз. драматургіі К.— прынцып своеасаблівага спаборніцтва інструмента, які саліруе, і аркестра. У К. найб. поўна выяўляюцца выразныя і тэхн. магчымасці інструмента, майстэрства выканаўцы.

Звычайна К. пішуць у санатна-цыклічнай форме. К. класічнага тыпу (канчаткова сфарміраваўся ў творчасці В. А. Моцарта і Л. Бетховена) мае 3 часткі (крайнія хуткія, сярэдняя — павольная). Ф. Ліст стварыў адначасткавы рамант. К. Тыповая прыналежнасць жанру — *кадэнцыя*. Найчасцей у якасці інструментаў, што саліруюць, выкарыстоўваюцца фп. і скрыпка (вядомыя творы Бетховена, Ф. Шапэна, Р. Шумана, Ф. Мендэльсона, Ліста, І. Брамса, Э. Грыга, П. Чайкоўскага, А. Глазунова, С. Рахманінава, С. Пракоф'ева, Дз. Шастаковіча, А. Хачатурана, Дз. Кабалеўскага). У наш час выявілася тэндэнцыя пашыраць кола канцэртавальных інструментаў, гэта характэрна і бел. музыцы. Паяўляюцца і К. для голасу з арк. (Р. Гліэр, Я. Глебаў). Першыя бел. К. створаны Я. Цікоцкім (для трамбона, 1934), А. Клумавым (для фп., 1939), Г. Столавым (для скрыпкі, 1941). У канцэртным жанры працавалі М. Аладаў (К. для флейты), А. Багатыроў (для віяланчэлі, кантрабаса), Р. Бутвілоўскі (для фп.), Г. Вагнер (для фп.), Дз. Камінскі (для фп., скрыпкі, віяланчэлі, цымбалаў), С. Картэс (для фп.), П. Падкавыраў (для скрыпкі), Э. Тырманд (для фп.), А. Янчанка (для аргана) і інш. бел. кампазітары. Разнавіднасці К.: канчэрта гроса — К. толькі для аркестра, заснаваны на супастаўленні розных арк. груп (пашыраны ў 17—18 ст.); канцэртная фантазія — К. у свабоднай форме (з бел. вядомая фантазія на тэму бел. нар. песні «Юрачка» для фп. з арк. Камінскага); канцэрціна — невялікі К.

3) Духоўны К.— віртуозны поліфанічны харавы твор рэліг. зместу (у рус. культавай музыцы вядомыя майстры жанру — М. Беразоўскі, Дз. Бартнянскі).

Літ.: Раабен Л. Н. Советский инструментальный концерт, Л., 1967; Степанцевич К. И. Белорусский концерт, Мн., 1967. *В. І. Ялатаў.* Мінск.

«КАНЦЭ́РТ», умоўная назва аперацыі бел. партызан па падрыве чыгункі ў Вял. Айч. вайну, якая праводзілася з 19 вер. да пач. ліст. 1943. Другі этап *«рэйкавай вайны»*. Распрацавана ЦК КП(б)Б і БШПР. Мэта — адначасовым падрывам чыгункі сарваць перавозкі ням.-фаш. войск у час наступлення Чырв. Арміі.

Планавалася ўзарваць 140 тыс. рэек і для гэтага забяспечыць партызан Беларусі 120 тыс. *т* боепрыпасаў, але ў сувязі з нялётным надвор'ем завезлі толькі 50%. Аперацыю ў ноч на 19 вер. пачала частка беларускіх партыз. злучэнняў. 25 вер. да яе далучыліся інш. партыз. злучэнні, а таксама партызаны Прыбалтыкі, Карэліі і Крыма (усяго 193 брыгады — 120 тыс. чал.). На тэр. Беларусі было ўзарвана 90 126 рэек, 1040 эшалонаў, 807 паравозаў, 6360 вагонаў, платформаў і цыстэрнаў, 72 чыг. масты і інш. Аперацыя праводзілася ва ўзаемадзеянні з часцямі Чырв. Арміі і аказала вял. дапамогу ў правядзенні наступальных аперацый сав. войск у 1943. *У. І. Лемяшонак.* Мінск.

КАНЦЭ́СІЯ (лац. concessio дазвол, уступка), дагавор, паводле якога дзяржава або муніцыпалітэт на пэўных умовах і на пэўны тэрмін здае ў эксплуатацыю другой дзяржаве або прадпрыемцу зямельныя нетры, лясы, гавані, зямельныя ўчасткі і інш. аб'екты. К. называюць таксама прадпрыемства, створанае на падставе такога дагавору.

Пры капіталізме К.— адна з формаў эксплуатацыі і заняволення слабаразвітых краін, сродак атрымліваць найбольшыя прыбыткі прадпрыемцамі і манаполіямі. Ахоплівае пераважна транспартныя і камунальныя прадпрыемствы. Пры імперыялізме фінансавы капітал выкарыстоўвае К. ўнутры краіны, каб падпарадкаваць свайму ўплыву дзярж. ўладу. У СССР К. існавалі ў пераходны перыяд ад капіталізму да сацыялізма і мелі прынцыпова іншы эканам. і паліт. характар. Паводле вызначэння У. І. Леніна, К. была пагадненнем Сав. улады з дзярж. капіталізмам перадавых краін супраць дробнабурж. стыхіі, дапаможным сродкам гасп. буд-ва (Тв., т. 32, с. 214—215).

КАНЧАЛО́ЎСКІ Пётр Пятровіч [9 (21).2.1876, г. Славянск — 2.2.1956], рускі савецкі жывапісец. Нар. мастак РСФСР (1946), правадз. чл. АМ СССР (1947). Вучыўся ў Парыжы (1897—98) і ў Пецярбургскай АМ (да 1906). Стварыў многа жыццесцвярджальных маляўнічых партрэтаў (Н. П. Канчалоўскай, 1925; У. У. Сафраніцкага, 1932; аўтапартрэт, 1943), пейзажаў («Ленінград. Мост», 1931; «Першы снег», 1940), нацюрмортаў («Бэз», 1933; «Глушцы», 1939), жанравых кампазіцый («Купанне чырвонай конніцы», 1928; «Палацёр», 1946; «На поўдні», 1947). Дзярж. прэмія СССР 1943. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі. У Дзярж. маст. музеі БССР 4 работы К.



Літ.: Кончаловский. Художественное наследие, М., 1964; Нейман М. Л., П. П. Кончаловский, М., 1967.

КАНЧА́ТАК (флексія), *афікс*, які афармляе *аснову* слова і паказвае яго сінтаксічную ролю ў сказе. Рыса флектыўных моў. К. абслугоўваюць сістэмы формаўтварэння слоў (напр., скланенні іменных часцін мовы, спражэнні дзеясловаў) як сродкі адрознівання розных формаў аднаго слова (словаформаў).

КАНЧЭ́ЎСКІ Арсен Уладзіміравіч [парт. псеўд. В. Камінскі, Уладак; 23.8(5.9). 1901, Вільня — 31.8.1931], дзеяч рэвалюц. руху ў Зах. Беларусі. З рабочых. Чл. КПЗБ з 1923. У 1919 у Наркамаце асветы Літбела, Віленскім губхарчкоме. Адзін з стваральнікаў і кіраўнікоў *Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі* (БРА), якая ў канцы 1923 уступіла ў КПЗБ, К. ўведзены ў склад ЦК КПЗБ, кіраваў парт. работай на вёсцы. 14.5.1926 арыштаваны і засуджаны на 4 гады турмы. На І з'ездзе КПЗБ (ліп. 1928) завочна выбраны канд. у чл. ЦК, пасля вызвалення з турмы (ліст. 1928) кааптаваны ў чл. ЦК, з кастр. 1929 чл. Бюро ЦК КПЗБ. Кіраваў дзейнасцю *«Змагання»*, гал. управы *Таварыства беларускай школы* і іх легальнымі выданнямі. Трагічна загінуў у Чорным моры. Пахаваны ў Мінску. *М. С. Арэхва.* Мінск.



КАНЫ (лац. Cannae), паселішча ў Паўд.-Усх. Італіі на р. Аўфід, каля якога 2 жніўня 216 да н. э. адбылася вялікая бітва 2-й Пунічнай вайны паміж рымскай арміяй пад кіраўніцтвам консула Тэрэнцыя Варона (80 тыс. пяхоты і 6 тыс. конніцы) і карфагенскай арміяй Ганібала (40 тыс. пяхоты і 10 тыс. конніцы).

Рым. армія ў поўным баявым парадку пацясніла цэнтр карфагенскага войска. Карфагенская конніца разбіла на флангах рым. конніцу і ўдарыла з тылу. Адборная карфагенская пяхота акружыла рым. войскі з флангаў. Загінула 48 тыс. рым. воінаў, карфагенская армія страціла 6 тыс. чалавек. Пасля бітвы многія італійскія і сіцылійскія гарады перайшлі на бок Ганібала, аднак гэта не прынесла

яму перамогі ў вайне — стратэгічнае становішча складвалася не на яго карысць. Бітва пры К. асталася ў гісторыі як выдатны прыклад ваен. майстэрства.

Літ.: Разин Е. А. История военного искусства, т. 1, М., 1955; Полибий. Всеобщая история в сорока книгах, пер. с греч., т. 1, М., 1890.

КАНЬЁН (ісп. cañón труба, цясніна), вузкая глыбокая рачная даліна, дно якой цалкам занята рэчышчам. Утвараецца ў межах высокіх плато або ў гарах, складзеных з водапранікальных асадкавых ці вывергнутых парод.

Фарміраванне К. адлюстроўвае ўрэз ракі пры паніжэнні *базіса эрозіі*. Схілы К. вельмі стромкія. Вядомы рачныя К. ў Паўн. Амерыцы (Вялікі К. ракі Каларада), на Эфіопскім нагор'і, у СССР — на Каўказе (р. Бзыб, Сулак), на Паміры (р. Язгулем, Пяндж), у Крыме, на Кольскім п-ве і інш. К. выяўлены і на дне акіянаў і мораў у межах мацерыковай водмелі і мацерыковага схілу (каля ЗША, Ньюфаўндленда, Францыі і інш.), насупраць вусцяў вялікіх рэк (Калумбія, Гудзон, Місісіпі, Дунай, Рыён, Інд і інш.). Мяркуюць, што падводныя К. ўзніклі на сушы, а потым апусціліся ці ўтварыліся ад тэктанічных разломаў на ўскраінах мацерыкоў.

КАНЬКАБЕ́ЖНЫ СПОРТ, скорасны бег на каньках на пэўныя дыстанцыі, адзін з найбольш пашыраных відаў зімовага спорту. Спаборніцтвы па К. с. праводзяцца на стадыёне, на бегавой канькабежнай дарожцы даўж. 400 *м*.

Катанні на каньках вядомы з стараж. часоў, калі карысталіся прымітыўнымі канькамі з дрэва і косці. Пазней з'явіліся драўляныя канькі з метал. палазамі і загнутымі наскамі, на якіх выразалі конскую галаву (адсюль назва — канькі). У Расіі з 17 ст. карыстаюцца цэльнаметал. канькамі. У 1889 у Маскве адбыўся першы афіц. чэмпіянат Расіі. Пасля Кастр. рэвалюцыі К. с. у нашай краіне атрымаў вялікую папулярнасць. З 1924 пачалі разыгрывацца пяршынствы СССР, з 1926 — чэмпіянаты краіны для жанчын. Жанчыны спаборнічаюць на дыстанцыях 500, 1000, 1500 і 3000 *м*. Мужчыны — на дыстанцыях 500, 1500, 3000 і 5000 *м* (малое мнагабор'е), 500, 1500, 5000 і 10 000 *м* (класічнае вялікае мнагабор'е, па якім разыгрываюцца пяршынствы рэспублік, краіны, Еўропы, свету). На Алімпійскіх гульнях спартсмены спаборнічаюць на кожнай дыстанцыі паасобку, пераможца лічыцца алімпійскім чэмпіёнам. З 1970 праводзяцца чэмпіянаты свету па спрынтэрскім мнагабор'і на дыстанцыях 500 і 1000 *м*, якія спартсмены прабягаюць два разы.

У БССР К. с. займаецца больш за 20 000 чал. (1971). Чэмпіянаты БССР упершыню праведзены ў 1933 (на простых каньках) і ў 1935 (на бегавых). Першымі чэмпіёнамі рэспублікі былі: З. Бальшакова (17 разоў). Б. *Бальшакоў* (9 разоў). Бел. спартсмен Э. *Матусевіч* — чэмпіён Еўропы (1965) і чэмпіён СССР (1964—66). Засл. трэнер БССР па К. с. З. Ф. Бальшакова.

Літ.: Петров Н. И. Конькобежный спорт, 2 изд., М., 1969; Мальгинов И. А. Заливка и содержание льда на катках, М., 1968.

В. Р. Полайцай. Мінск.

КАНЬКОЎ Пётр Васілевіч [3(16).7.1909, с. Цыбізаўка Кірсанаўскага пав. Тамбоўскай губ.— 7.8.1970], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Камандзір батальёна. Вызначыўся на тэр. Камарынскага р-на Палескай вобл. У ноч на 29.9.1943 разам з батальёнам на падручных сродках пераправіўся цераз Дняпро, выбіў праціўніка з траншэй і 4 дні адбіваў варожыя контратакі.

КАНЬЯК, моцны спіртны напітак з спецыфічным букетам і смакам, прыгатаваны з каньячнага спірту, змякчанай вады і цукровага сіропу. Назва паходзіць ад г. Каньяк (дэпартамент Шаранта ў Францыі), дзе ўпершыню развілася вытворчасць К.

Гатуюць К. з спірту, атрыманага перагонкаю сухіх вінаградных вінаў і вытрыманага ў дубовых бочках. Пры вытрымцы каньячны спірт абагачаецца дубільнымі рэчывамі і набывае характэрны смак і колер. Паводле якасці і часу вытрымкі К. падзяляюцца на ардынарныя, марачныя і калекцыйныя. Ардынарныя: «3 зорачкі» (вытрымка не менш трох гадоў, мацунак 40°), «4 зорачкі» (адпаведна 4 гады, 41°), «5 зорачак» (5 гадоў, 42°). Марачныя: К. вытрыманы, «КВ» (узрост 6—7 гадоў, 42°), К. вытрыманы вышэйшай якасці, «КВВК» (8—10 гадоў, 43—45°). К. стары, «КС» (больш за 10 гадоў, 40—57°). Калекцыйныя К. («Ерэван», «Малдова») робяцца з высакаякасных марачных і ардынарных К. На Беларусі вытворчасць К. асвоена на Мінскім вінна-гарэлачным з-дзе ў 1963; з-д выпускае К. «3, 4 і 5 зорачак».

Літ.: Малтабар В. М. и Фертман Г. И. Технология коньяка, М., 1971; Охременко Н. С. Лучшие вина и коньяки СССР, М., 1969.

М. Т. Бялко. Мінск.

КАНЬЯКСКІ ВЕК (ЯРУС), ранні час познамелавой эпохі (трэці знізу ярус верхнемелавога аддзела) *мелавога перыяду (сістэмы)*. Вылучаны Г. Каканам у 1857 каля г. Каньяк у Францыі. Адклады пашыраны на значнай тэр. СССР. На Беларусі развіты на невялікай плошчы ў заходняй і ўсходняй частках. Складзены з мергельна-мелавых парод, магутнасць да 60 *м*.

КАНЭ Майсей Юдавіч [17(30).12.1902, Віцебск — 12.9.1964), беларускі савецкі вучоны ў галіне машынабудавання, лаўрэат Дзярж. прэміі СССР (1949). Чл. КПСС з 1940. З рабочых. Скончыў Маск. вышэйшае тэхн. вучылішча (1926). У 1928—45 на маск. аўтазаводах. У 1945—54 на Мінскім аўтазаводзе. У 1954—64 на кафедры тэхналогіі машынабудавання (з 1955 дацэнт кафедры) Бел. політэхн. ін-та. Дзярж. прэмія СССР прысуджана за ўдзел у стварэнні грузавога дызельнага аўтамабіля ЯАЗ-200 (МАЗ-200).

КАН'ЮГА́ЦЫЯ (лац. conjugatio злучэнне), 1) адмысловая форма полавага працэсу ў некаторых прасцейшых арганізмаў. У інфузорый, напр., дзве асобіны (клеткі) часова злучаюцца і абменьваюцца ядрамі. У кішачнай палачкі Escherichia coli у выніку К. аб'ядноўваюцца і рэкамбінуюцца гены розных бацькоўскіх тыпаў. 2) Злучэнне спецыялізаваных клетак (гамет) у вышэйшых раслін і жывёл. 3) Папарнае злучэнне гамалагічных храмасом у *меёзе*.

КАНЮКІ, сарычы (Buteo), род *драпежных птушак* сямейства ястрабіных. Пашыраны на ўсёй зямлі, акрамя Антарктыкі. 23 віды. У СССР 4, на Беларусі 2 віды: звычайны К. (B. buteo) і касматаногі К., або зімняк (B. lagopus).

Даўж. цела звычайнага К. каля 50 *см*, маса 600—1200 *г*. Самкі большыя за самцоў. Апярэнне бурае. Пералётная птушка. Гняздуецца на дрэвах. Нясе 2—5 яец. Корміцца мышападобнымі грызунамі, птушкамі, жабамі, дробнымі насякомымі. Касматаногі К. (даўж. цела 51—61 *см*, маса 800—1300 *г*) гняздуецца ў тундры і лесатундры. Нясе 3—4 яйцы. Корміцца пераважна лемінгамі. На Беларусі трапляецца зімою. Абедзве птушкі карыс-

ныя, ахоўваюцца. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Белавежская пушча*.

В. З. Галадушка. Мінск.

КАН'ЮНКТУ́РА эканамічная (італьян. congiuntura ад лац. conjungo злучаю), становішча эканомікі сусв. гаспадаркі, эканомікі асобных краін ці якой-небудзь галіны гаспадаркі за пэўны перыяд (месяц, квартал, год). Характарызуецца дынамікай і ўзроўнем вытворчасці, капітальнага буд-ва, знешняга і ўнутр. гандлю, попыту і прапаноў, таварных запасаў, цэн, прыбыткаў, заработнай платы, крэдыту, грашовага абарачэння і інш. Гал. ролю ў К. адыгрывае стан вытворчасці, які ўплывае на размеркаванне, абарачэнне, спажыванне прадукцыі ў грамадстве.

У капіталіст. краінах К. адлюстроўвае працэс цыклічнага развіцця вытворчасці, складваецца ў адпаведнасці з эканам. законамі капіталізму, канкурэнцыяй і анархіяй вытворчасці, паказвае супярэчнасці капіталіст. ўзнаўлення. Пры сацыялізме фарміруецца ў ходзе планамернага паступальнага развіцця эканомікі. Адрозніваюць агульнагасп. і таварную К. Аналіз агульнагасп. К. ўлічваецца пры планаванні, кіраванні і эканам. стымуляванні вытворчасці. Таварная К. (К. асобных сфераў узнаўлення) характарызуецца суадносінамі попыту і прапаноў, адыгрывае важную ролю ў планаванні тавараабароту і цэн. У СССР створаны Усесаюзны НДІ вывучэння попыту насельніцтва на тавары нар. спажывання і кан'юнктуры гандлю (філіял у Мінску).

М. Г. Сонцава. Мінск.

КАН'ЮНКТЫВІ́Т (лац. conjunctiva злучальная+itis запаленне), запаленне слізістай (злучальнай) абалонкі вока. Адна з найб. пашыраных (35—47,7%) *вачэй хвароб*.

Адрозніваюць востры і хранічны К. Найчасцей бывае востры, выклікаецца інфекцыяй, дзеяннем розных хім. рэчываў, траўмамі і інш. Прыкметы К.: пачырваненне слізістай абалонкі вока, рэзь, слёзацячэнне, святлобоязь, слізістыя або слізістагнойныя выдзяленні. Пры своечасовым лячэнні ўскладненняў не пакідае, доўжыцца 3—6 дзён. К. ад трахомы, ганарэі, дыфтэрыі пакідаюць язвы рагавой абалонкі, бяльмо, слепату. Хранічнаму спрыяюць пыл, дым, недастатковае асвятленне, некарыгіраваныя акулярамі анамаліі зроку, анеміі, гельмінтозы, адэноіды, парушэнне абмену рэчываў. Лячэнне: ліквідацыя асн. прычын, антыбіётыкі, сульфаніламіды, цынкавыя кроплі, рэзарцын, агульнаўмацавальныя сродкі. Прафілактыка: асабістая і агульная гігіена.

Літ.: Золотарева М. М. Глазные болезни, 2 изд., Мн., 1964; Архангельский В. Н. Глазные болезни, 2 изд., М., 1969.

А. А. Ілюшэнка. Мінск.

КАН'ЮНКЦЫЯ (лац. conjunctio саюз, сувязь), аперацыя матэматычнай логікі, якая аб'ядноўвае два ці больш выказванняў з дапамогай лагічнай звязкі «і».

Сімвалічна К. запісваюць: *A&B* (выкарыстоўваюць таксама знакі ∧, ·). К. не супадае поўнасцю з ужываннем злучніка «і» ў моўных выразах, бо не прадугледжвае сувязі выказванняў па сэнсе. Кан'юнктыўнае выказванне ісціннае тады, калі кожнае з зыходных выказванняў ісціннае, і няісціннае, калі яны адначасова няісцінныя або няісціннае адно з выказванняў. У табліцы *I* паказвае ісціннасць, *H* — няісціннасць выказванняў.

A	*B*	*A&B*
I	*I*	*I*
I	*H*	*H*
H	*I*	*H*
H	*H*	*H*

Літ.: Гл. пры арт. *Матэматычная логіка*.

КАНЮХІ, вёска ў Бераставіцкім р-не Гродзенскай вобл., на р. Свіслач (прыток Нёмана). Цэнтр Глебавіцкага с/с і калгаса імя XXII з'езду КПСС. За 30 *км* на Пн ад Вял. Бераставіцы, 40 *км* ад Гродна. 420 ж., гасп. 125 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Помнік сав. воінам-аднавяскоўцам, якія загінулі ў Айч. вайну.

КАНЮХІ, вёска ў Падароскім с/с Ваўкавыскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса «За Радзіму». За 21 *км* на ПдУ ад Ваўкавыска, 111 *км* ад Гродна, каля аўтамаб. дарогі Ваўкавыск — г. п. Ружаны (3 *км*). 348 ж., двароў 92 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, вет. пункт, магазін. Ням.-фаш. захопнікі расстралялі 16 жыхароў вёскі.

КАНЮХІ, вёска ў Грозаўскім с/с Капыльскага р-на Мінскай вобл., на р. Лакнея. Цэнтр калгаса «Радзіма». За 24 *км* на У ад Капыля, 97 *км* ад Мінска, 20 *км* ад чыг. ст. Слуцк, на аўтамаб. дарозе Капыль — в. Грэск. 747 ж., двароў 127 (1971). Сярэдняя школа-інтэрнат, васьмігадовая школа, клуб, б-ка, магазін. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны.

КАНЮШЫ́НА (Trifolium), род адна- і шматгадовых травяністых раслін сям. матыльковых. Вядома каля 300 відаў, пашыраных пераважна ў Еўропе, Азіі, Паўн. Амерыцы. У СССР 70 відаў. Большасць з іх — добрыя кармавыя расліны, багатыя на бялкі. Асаблівае значэнне мае К. чырвоная, дзятліна (T. pratense), дзікарослая і культурная. На Беларусі яна — асн. шматгадовая трава ў севазваротах. Дае зялёную масу і сена высокай якасці; ідзе на прыгатаванне вітаміннай травяной мукі і сенажу. Павышае ўрадлівасць глебы — стварае магутны травяністы пласт і назапашвае азот. Добры папярэднік збожжавых, тэхн. і прапашных культур. Бывае двух тыпаў: раннеспелая (двухукосная) і познаспелая (аднаўкосная). На Беларусі сфарміраваліся каштоўныя старамясцовыя папуляцыі К. чырвонай, зацверджаныя як сарты. З іх раянаваны: Слуцкая раннеспелая, Полацкая раннеспелая, Мінская познаспелая. Раянаваны таксама сарты селекцыі Бел. НДІ земляробства: Зазерская і Цудоўная.



Канюшына чырвоная.

К. чырвоная — расліна выш. 35—70 *см*. Корань стрыжнёвы, сцябло слабаапушанае, галінастае, лісце трайчастае, кветкі чырвона-фіялетавыя ў шарападобных або прадаўгаватых галоўках, плод — аднанасенны (радзей двухнасенны) струк. К. чырвоная высяваецца ўвесну пад покрыва азімых або яравых культур. Каб атрымаць высокія ўраджаі, кіслыя глебы вапнуюць, перад сяўбою дадаюць фосфарна-калійныя ўгнаенні. Менш пашыраны К. белая (T. repens) і К. ружовая (T. hybridum). Выкарыстоўваюцца для стварэння культурных лугоў і пашы.

Літ.: Клевер, 2 изд., М., 1963; Семенов А. Л. и Власова К. С. Семеноводство многолетних трав, Мн., 1971; Культура многолетних трав в БССР, Мн., 1955.

КАНЯ, птушка сям. сяўцоў атр. сеўцападобных. Гл. *Кнігаўка*.

КАП (Карр) Эўген Артуравіч [н. 13(26).5. 1908, Астрахань], эстонскі савецкі кампазітар. Нар. арт. СССР (1956). Чл. КПСС з 1947. У 1931 скончыў Талінскую кансерваторыю, з 1947 праф. гэтай кансерваторыі. Пачынальнік эст. сав. оперы («Агні помсты», паст. 1945, Дзярж. прэмія СССР 1946) і балета («Калевіпоэг», паст. 1948, Дзярж. прэмія СССР 1949). З інш. твораў: оперы «Пясняр свабоды» (паст. 1950, Дзярж. прэмія СССР 1952), «Зімовая казка» (дзіцячая, паст. 1959), «Няўлоўная» (паст. 1961), балет «Золатапапрадухі» (паст. 1956), кантата «Улада народа» (1949), 3 сімфоніі (1943, 1954, 1964). Дэп. Вярх. Савета СССР 4—5-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, 3 інш. ордэнамі.

Літ.: Кырвитс Х. Эуген Капп, М., 1959.

КАПА, 1) часовая ўкладка сена ці саломы ў кучу. 2) У беларусаў, рускіх, украінцаў і палякаў адзінка лічэння, роўная 60 (60 снапоў, як, гуркоў і інш.). 3) Грашовая адзінка, якая адпавядала 60 *грошам*. Пашырана на Беларусі ў 14—18 ст. У 17 ст. адпавядала 75 польскім грошам або 50 рус. капейкам. 4) На Беларусі і Украіне ў часы феадалізму сход сяляк, які разглядаў судовыя справы (гл. *Копны суд*) і зямельныя спрэчкі.

КАПАВОЗ, с.-г. машына, прызначаная для транспартавання копаў сена, саломы і складвання іх у стагі, а таксама для падбору сена з валкоў, пагрузкі гною, сыпкіх і паштучных грузаў у транспартныя сродкі.



Універсальны капавоз КУН-10.

Агрэгатуюцца з трактарам «Беларусь» як навясное абсталяванне. Рабочая частка К. складаецца з грабельнай рашоткі (вілаў для гною, каўша для сыпкіх грузаў), прыцісной рамкі і механізмаў падымання і апускання, якія прыводзяцца ў дзеянне ад гідрасістэмы трактара. Найб. пашыраны К. тыпаў КНУ-11 і КУН-10. Універсальны К. КНУ-11 мае адну грабельную рашотку і ўстанаўліваецца на задняй частцы рамы трактара. Універсальны К. КУН-10 больш прадукцыйны — мае дзве пагрузачныя рашоткі і можа падымаць да тоны грузу на вышыню да 3,6 *м*.

Літ.: Иванов И. С. и др. Сельскохозяйственные машины, М., 1962; Сельскохозяйственная техника. Каталог, 3 изд., М., 1967.

І. І. Півуноўскі.

КАПАЕЎКА, рака, правы прыток Буга (бас. Віслы). Даўж. 39 *км*. Цячэ на тэр. УССР і ў Брэсцкім р-не БССР. Вадазбор (264 *км*²) у межах Валынскай грады. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 0,9 *м*³/*сек*. Выкарыстоўваецца пры асушэнні балотаў.

КАПАР, 1) К. надшахтавы — канструкцыя, якая ўстанаўліваецца над вусцем ствала, каб трымаць прыстасаванні і механізмы шахтавага пад'ёму. Дасягае выш. 80 *м* і можа ўтрымаць нагрузку да 400 *т*. 2) К. палевы — драўляная ці метал. канструкцыя для падымання, установкі і накіравання паляў і палевага молату пры забіўцы паляў у грунт. Бываюць перасоўныя (на палазах ці колах) і плывучыя. 3) К. драбільны — прыстасаванне для драбнення метал. лому і адходаў вытворчасці на металург. з-дах; складаецца з крана ці трыножка для падымання (звычайна з дапамогай лябёдкі) «бабы» масай да 10 *т*. 4) К. выпрабавальны — агульная назва прылад, якімі вызначаюць здольнасць матэрыялаў супраціўляцца ўдарным нагрузкам. Бываюць маятнікавыя, ратацыйныя, круцільныя і інш.



Схема надшахтавага капара: *1* — падымальная машына; *2* — падкосіна; *3* — шківы; *4* — станок; *5* — клець; *6* — апорная рама.

КАПАРАЎКА, вёска ў Рэчыцкім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 17 *км* на ПдЗ ад Рэчыцы, 55 *км* ад Гомеля, 9 *км* ад чыг. ст. Дземяхі, каля аўтамаб. дарогі Гомель — Калінкавічы (1 *км*). 571 ж., двароў 172 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, аддз. сувязі, магазін.

КАПАТКЕВІЧЫ, гар. пасёлак (з 1938; да 1962 — цэнтр Капаткевіцкага р-на) у Петрыкаўскім р-не Гомельскай вобл., на р. Піч. За 35 *км* на ПнУ ад Петрыкава, 179 *км* ад Гомеля, 18 *км* ад чыг. ст. Пліч. 2,6 тыс. ж. (1972).

К. вядомыя з 17 ст., належалі кн. Яланскім. Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793) у складзе Расіі, мястэчка. У 1863 секвестраваны, у 1868 належалі генералу Цылаву. У Вял. Айч. вайну ў партыз. зоне. К. былі спалены ням.-фаш. акупантамі, загінула 112 жыхароў.



Капаткевічы. Вуліца Школьная.

Прадпрыемствы: маслазавод, цэх камбіната буд. матэрыялаў, камбінат быт. абслугоўвання, рыбгас «Трэмля», аддз. Сельгастэхнікі, лясгас. Сярэдняя школа, школа рабочай моладзі, школа-інтэрнат, дзіцячыя сад і яслі, Дом піянераў, клуб, кінатэатр, 2 б-кі, бальніца. Брацкая магіла 23 жыхароў і помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

КАПАЦЭВІЧ Вольга Цімафееўна (1882, в. Ісерна Слуцкага пав. Мінскай губ.— 9.2. 1967), грамадская дзяячка БССР. З сялян. Змагалася супраць бандаў Булак-Балаховіча. Удзельніца Усесаюзнай с.-г. выстаўкі ў Маскве (1923). Дэлегатка міжнар. кангрэсу жанчын-камуністак (1924). У 1925 нам. наркома сац. забеспячэння БССР. У Айч. вайну партыз. сувязная. Чл. ЦВК БССР (1924—25). К.— адна з гераінь бел. хранік.-дакумент. фільма «Арлінае крыніца» (1966, рэжысёр В. Сукманаў, сцэнарый А. Вялюгіна).

КАПАЦЭВІЧЫ, вёска ў Салігорскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Новае Палессе». За 30 *км* на ПдЗ ад Салігорска, 163 *км* ад Мінска. 219 ж., двароў 53 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. 16.2.1943 вёску спалілі ням.-фаш. карнікі, загубілі 426 мірных жыхароў (паводле ўдакладненых звестак). На іх брацкай магіле помнік.

КАПАЧЫ, вёска ў Мсціслаўскім р-не Магілёўскай вобл., каля р. Белая Натапа (0,6 *км*). Цэнтр сельсавета і саўгаса «Пісараўшчына». За 28 *км* на З ад Мсціслава, 88 *км* ад Магілёва, 10 *км* ад чыг. ст. Ходасы. 523 ж., двароў 162 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячыя яслі, бальніца, аптэка, аддз. сувязі, сталовая, швейная майстэрня, 3 магазіны. 26.9.1943 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі. Помнік 34 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

КАПЕЙКА, сярэбраная, пазней медная манета дарэвалюц. Расіі; медная, пазней бронзавая манета СССР, якая складае $^1/_{100}$ частку рубля.

Упершыню паявілася пасля грашовай рэформы 1534, калі адначасова з маскоўскай выпускалася і поўгарадская *дзенга* (паўгародка), якая пасля атрымала назву К., бо на ёй быў малюнак конніка з капʼём. Першапачатковая маса 0,68 *г*, у 1613 — 98 0,48 *г*, у 1698—1718 0,28 *г*. У 1655—63 адначасова з сярэбранай чаканілася медная К. (на суму 400 руб. з 1 пуда медзі). У 1763—81 акрамя агульнадзяржаўнай К. выпускалася К., якая ўваходзіла ў асобую серыю т. зв. «сібірскай манеты» (на суму 25 руб. з 1 пуда медзі). Эмісія К. Рас. імперыі спынена ў 1916. У СССР чаканіліся медныя (1924—25) і бронзавыя К. (з 1926). Тыпы сав. К. мяняліся ў 1935 і 1961.

Літ.: Спасский И. Г. Русская монетная система. 4 изд., Л., 1970; Рябцевич В. Н. и Титок В. А. Русская монетная медь XVII века в кладах Белоруссии и Украины. у кн.: Древности Белоруссии, Мн., 1969.

В. Н. Рабцэвіч.

КАПЕЙСК, горад абл. падпарадкавання ў Чэлябінскай вобл. РСФСР. Узнік у 1920 як чыг. ст. 155 тыс. ж. (1971). Адзін з цэнтраў здабычы вугалю на Урале. 9 вугальных шахтаў, 3 маш.-буд. з-ды (выпуск горных машын і горнага абсталявання, дарожных, будаўнічых і с.-г. машын), абагачальная ф-ка, 2 швейныя ф-кі. Маблевы камбінат. Вячэрнія аддз. Чэлябінскага політэхн. і Свярдлоўскага горнага ін-таў. Горны і лёгкай прамысловасці тэхнікумы, мед. вучылішча. Краязн. музей.

КАПЕНГАГЕН (København), сталіца Даніі. Прамысловы і культ. цэнтр краіны. Размешчаны на ўсх. узбярэжжы в-ва Зеландыя і прылеглым да яго невялікім в-ве Амагер;



Капенгаген. Агульны выгляд.

порт на беразе праліва Эрэсун. У К. з прыгарадамі каля 1,8 млн. ж. (1969). У сталіцы сканцэнтравана $^1/_4$ частка прамысл. прадпрыемстваў краіны, каля 40% усяго самадзейнага насельніцтва; праз порт праходзіць $^1/_2$ знешняга гандлю Даніі. Вузел міжнар. паветраных (аэрапорт Каструп) і чыгуначных ліній. Наладжана чыг. паромная сувязь з Мальмё (Швецыя) і Варнемюндэ (ГДР). Прамысловасць пераважна апрацоўчая, у асн. на прывазной сыравіне: металаапрацоўчая, маш.-буд., суднабудаўнічая, аўтамаб., прыладабудаўнічая, электратэхн., хім., дрэваапрацоўчая, харч., гарбарна-абутковая, тэкстыльная і інш. Ун-т (з 1479), бат. сад. Музеі: Дзярж. маст. музей, Нац. музей, зборы Хіршспрунга, Новая карлсбергская гліптатэка, Дацкі музей дэкар. мастацтва, Палац Росенбарг, Музей Торвальдсена.

Упамінаецца ўпершыню ў 1043. З 1443 каралеўская рэзідэнцыя і сталіца Даніі. У 1910 у К. адбылася 2-я міжнар. канферэнцыя сацыялістак, якая прыняла рашэнне пра святкаванне Міжнароднага жаночага дня. У жн.—вер. 1910 у К. жыў У. І. Ленін. 15(28).8—21.8(3.9).1910 па ініцыятыве Леніна склікана нарада левых сацыялістаў, якія ўдзельнічалі ў Капенгагенскім кангрэсе 2-га Інтэрнацыянала. У 2-ю сусв. вайну акупаваны (9.4. 1940—5.5.1945) ням.-фаш. захопнікамі. З 1943 асн. цэнтр Руху Супраціўлення ў Даніі. Сярод арх. помнікаў 17—19 ст.: будынак біржы, палац-парламент Крысціянсбарг, палац Шарлотэнбарг, ансамбль Амаліенбарг, пл. Ратушы з будынкам ратушы і інш. З пач. 20 ст. К. расшыраецца радыяльна на ПнЗ і на Пд на в-ве Амагер, паступова ўключае ў сябе прыгарады, буйныя жылыя масівы (комплекс Белахай і інш.). Найб. значныя пабудовы 20 ст.: комплекс радыёцэнтра, будынкі фірмаў Есперсен, Сміт, ц. Грунтвіга, аэравакзал з гасцініцай «Роял».

КАПЕРНІК (Kopernik, Copernicus) Мікалай [19.2.1473, г. Торунь (Польшча) — 24.5.1543], польскі астраном, стваральнік геліяцэнтрыч-



най сістэмы свету. Вучыўся ў Кракаўскім ун-це (1491—95), удасканальваў веды ў італьян. ун-тах, дзе вывучаў кананічнае права, медыцыну, матэматыку, астраномію. З 1512 жыў у г. Фромбарк. Сярод сучаснікаў быў вядомы як дзярж. дзеяч, умелы ўрач і вялікі знаўца астраноміі. Больш як 30 гадоў працаваў над тв. «Пра абарачэнні нябесных сфер» (шэсць кніг, апубл. ў 1543), у якім распрацаваў новую тэорыю будовы свету — геліяцэнтрычную (гл. *Сістэмы свету*). Вучэнне К., паводле якога Зямля не займае цэнтральнага становішча ў Сусвеце, а з'яўляецца адной з планет, абарачаецца, як і інш. планеты, вакол Сонца і верціцца вакол сваёй восі, поўнасцю адмаўляла ранейшую геацэнтрычную (з Зямлёю ў цэнтры) сістэму свету Пталамея, псеўданавуковую і штучна пабудаваную. К. праводзіў ідэю пра адзінства свету: «неба» і «зямля» падпарадкоўваюцца законам, аднолькавым для ўсяго Сусвету. Шляхам матэм. разлікаў ён даволі дакладна склаў план Сонечнай сістэмы. Тэорыя К. не пазбаўлена некат. недахопаў: у ёй яшчэ захоўваецца ўяўленне пра канечны Сусвет, абмежаваны сферай нерухомых зорак, прынцып раўнамернага руху планет па кругавых арбітах. Адкрыццё К. мела рэвалюц. характар, бо зрабіла карэнны пералом у астр. навуцы, адкрыла шырокі шлях навуковаму светапогляду, нанесла сакрушальны ўдар па рэліг. уяўленнях аб выключным становішчы Зямлі ў Сусвеце. На Беларусі імя К. вядома з 16 ст.; яго погляды адлюстраваны ў многіх філас. рукапісах, прычым некаторыя аўтары (К. *Нарбут*, А. *Доўгірд* і інш.) трактавалі вучэнне К. як дакладную тэорыю, насуперак папскай буле аб *«Індэксе забароненых кніг»*.

Тв.: Рус. пер.— О вращениях небесных сфер, М., 1964.

Літ.: Николай Коперник. Сб. статей и материалов к 410-летию со дня смерти (1543—1953). М., 1955; Рыбка Э. Николай Коперник, пер. с польск., Варшава, 1967.

КАПЕ́ТДАГ, горны хрыбет у Сярэдняй Азіі, на ПдЗ Туркм. ССР і ў Іране. Даўж. 600 *км*. Найвыш. пункт г. Хезармесджэд (3117 *м*) у Іране.

Складзены К. з карбанатных парод мелавога і палеагенавага ўзросту. Утварыўся ў альпійскую складкавасць. Значная сейсмічнасць. Клімат сухі з гарачым летам і цёплай зімой. Глебы — горныя шэразёмы і карычневыя. Расліннасць паўпустынная і горна-стэпавая. У далінах лясы з грэцкага арэху, фісташнікі, сады (міндаль, інжыр, яблыні), вінаграднікі. У гарах паша.

КАПЕ́Ц, 1) месца і даўні спосаб хавання на зіму бульбы і агародніны. На Беларусі пашыраны наземныя К., якія закладваюцца на ўзвышаных месцах, часам на агародах. Наз. таксама бурт.

Бульба або агародніна насыпаюцца ў круглую або доўгую кучу каля 2 *м* шыр. і да 1 *м* выш. Укрываюцца саломаю, наверх насыпаецца зямля, у моцныя маразы К. накрываюць гноем. Для вентыляцыі ў цэнтр К. ўтыкаецца некалькі палак. Бываюць і траншэйныя К., калі агародніна засыпаецца ў выкапаныя канавы і таксама ўкрываецца саломай і зямлёю. У некат. месцах Беларусі, найб. на Палессі, К. называюць стараж. курганы.

2) Насып вакол межавога слупа (дзялянкі ў лесе) пры каморніцкіх абмерах.

КАП'Е́, колючая ці кідальная зброя. Вядомая з эпохі палеаліту, выкарыстоўвалася ва ўсім свеце на вайне і паляванні.

Першапачаткова мела выгляд кія з завостраным канцом. Пазней мела плоскі ці востры наканечнік (з каменю, косці, металу) і дрэўка даўж. 1,5—5 *м*. Як узбраенне захавалася ў плямёнаў Аўстраліі, Акіяніі, Бразіліі. К. наз. спартыўны кідальны снарад. Гл. таксама *Дроцік* і іл. на ўкл. да арт. *Жалезны век*.

КАПІГО́ЛЬД (англ. copyhold ад copy копія+hold трыманне), асноўная і найбольш бяспраўная форма феадальна-залежнага сялянскага трымання ў Англіі ў перыяд позняга сярэдневякоўя і ў пач. новага часу.

Узнік з трымання англ. прыгонных (віланаў) у 14—15 ст. На права валодаць зямельным участкам селянін атрымліваў копію — выпіску з пратакола манарыяльнай курыі. Пажыццёвае, рэдка спадчыннае ўладанне. У адрозненне ад свабоднага сялянскага ўладання *(фрыгольда)* не абараняўся законам. Шматлікія павіннасці залежалі ад волі лорда. З бяспраўя сялян вынікала іх абеззямельванне ў перыяд *агароджвання зямель* 16—17 ст. Юрыдычна К. скасаваны ў 1925.

КАПІЕ́ВІЧ (Капіеўскі) Ілья Фёдаравіч (каля 1651—1714), асветнік, кнігавыдавец. Нарадзіўся ў Беларусі. Вучыўся ў Слуцкай гімназіі. У Амстэрдаме выдаваў кнігі для Расіі. Прыхільнік рэформаў Пятра I. Прапагандаваў свецкія навукі, садзейнічаў развіццю асветы і распаўсюджванню навук. ведаў у Расіі. Склаў і выдаў першыя на рус. мове падручнікі і кнігі (арыфметыку, руска-лаціна-нямецкі, руска-лаціна-галандскі слоўнікі), каляндар, навуч. дапаможнікі. Пераклаў і выдаў байкі Эзопа. Аўтар першай на рус. мове зорнай карты. З 1699 да 1706 надрукаваў каля 20 кніг. Апошнія гады жыў у Маскве, працаваў у Пасольскім Прыказе.

Кнігі, складзеныя і выдадзеныя К.: «Введеніе краткое во всякую исторію...», 1699; «Краткое и полезное руководение во арифметику...», 1699; «Уготование и толкование ясное, поверстания кругов небесных...», 1699; «Номенклятор (лексикон) на русском, латинском и немецком языках», 1700; «Номенклятор на русском, латинском и голландском языках», 1700; «Latina grammatica...», 1700; «Притчи Езоповы...», 1700; «Морского плавания книга...», 1701; «Святцы, или календарь...», 1702; «Руководение в грамматику славенороссийскую...», 1706; і інш.

Літ.: Быкова Т. А. и Гуревич М. М. (сост.). Описание изданий, напечатанных кириллицей. 1689 — январь 1725. М.— Л., 1958; Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии, Мн., 1962, с. 320—335; Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі, Мн., 1968, с. 118—120.

Э. К. Дарашэвіч. Мінск

КАПІЕ́Ў Эфендзі Мансуравіч [28.2(13.3). 1909, с. Кумух, Дагестан — 27.1.1944], дагестанскі савецкі пісьменнік. З сям'і лудзільшчыка і гравёра. Вучыўся ў Ленінградскім маш.-буд. ін-це. У 1931—35 адказны сакратар даг. пісьменніцкай арг-цыі. З 1935 у газ. «Молодой ленинец» (Пяцігорск). У 1942—43 франтавы карэспандэнт. Пісаў на рус. мове. Друкавацца пачаў у 1931. У кн. навел «Паэт»

(1940, выд. 1944) стварыў абаяльны вобраз нар. паэта Сулеймана. Аўтар «Франтавых нарысаў» (1944), прасякнутых героікай барацьбы з ням.-фаш. захопнікамі. Талент пісьменніка-навеліста выявіўся і ў «Запісных кніжках» (выд. 1956). Перакладаў на рус. мову творы С. Стальскага, горскі фальклор (зб. «Песні горцаў», 1939; «Разьба па камені», 1940), склаў зб. «Дагестанскія паэты» (1932), «Дагестанская анталогія» (1934). Творы К. перакл. на многія мовы народаў СССР і за мяжою.

Тв.: Разговор о поэзии, М., 1940; Поэт, М., 1945; Неизданное, Махачкала, 1959; Избранное, М., 1966.

Літ.: Капиева Н. В. Жизнь, прожитая набело. О творчестве Эффенди Капиева, М., 1969; Крамов И. Эффенди Капиев, М., 1964; Чудакова М. Эффенди Капиев, М., 1970.

С. Х. Ахмедов. Махачкала.

КАПІЛЯ́РНАЯ ВАДА́ (ад лац. capillaris валасяны), від *падземных водаў*, якія рухаюцца па капілярах ад дзеяння сіл малекулярнага прыцягнення паміж вадою і часцінкамі грунту. Гл. таксама *Водныя ўласцівасці горных парод*.

КАПІЛЯ́РНЫЯ З'ЯВЫ, з'явы, звязаныя з *паверхневым нацяжэннем* і абумоўленыя сіламі малекулярнага ўзаемадзеяння. Інакш, гэта *паверхневыя з'явы* на мяжы падзелу датыкальных целаў.



а

б

Да К. з. належаць, напр., падняцце і ўсмоктванне вадкасці ў вузкія трубкі (капіляры) ці поры (рыс. *а*), калі сценкі іх змочваюцца вадкасцю (паверхня вадкасці ў капілярах набывае форму ўвагнутага меніска); апусканне і выштурхоўванне вадкасці (рыс. *б*), калі сценкі капіляраў ці пораў не змочваюцца гэтай вадкасцю (форма паверхні — выпуклы меніск). Падняцце і апусканне вадкасці абумоўліваецца капілярным ціскам, які ствараецца паверхневым нацяжэннем на скрыўленых вадкіх паверхнях. К. з. маюць вялікае значэнне ў жыццядзейнасці жывёл і раслін, выкарыстоўваюцца ў тэхніцы і навуцы.

Літ.: Оно С. и Кондо С. Молекулярная теория поверхностного натяжения в жидкостях, пер. с англ., М., 1963.

Б. В. Бокуць. Мінск.

КАПІЛЯ́РЫ, найдрабнейшыя крывяносныя і лімфатычныя сасуды, якія пранізваюць органы і тканкі ў большасці жывёл і чалавека. Гл. *Крывяносная сістэма*, *Лімфатычная сістэма*.

КАПІРАВА́ЛЬНА-РАЗМНАЖА́ЛЬНАЯ МАШЫ́НА, апарат для вырабу копій з чарцяжоў на кальцы на святлокапіравальную паперу.

Літ.: Засов В. Д. и Юрин В. Н. Размножение технической документации, М., 1968; Черненко Л. Д. и Долганников В. М. Оборудование множительных лабораторий, Киев, 1969.

КАПІРАВА́ЛЬНЫ СТАНО́К, 1) у металаі дрэваапрацоўцы — станок для апрацоўкі крывалінейных паверхняў вырабу па капіры (мадэлі, шаблоне, чарцяжы). У машынабудаванні найб. пашыраны капіравальна-фрэзерныя станкі. Апрацоўку крывалінейных паверхняў робяць таксама на універсальных такарных станках з капіравальным прыстасаваннем. 2) У фотатэхніцы — апарат для кантактавага друку з негатыву пазітыўных выяў (адбіткаў на паперы ці дыяпазітываў на фотаплёнцы). Найб. дасканалыя аўтам. К. с., якія не толькі хутка друкуюць, але і даюць магчымасць вызначаць вытрымку пры друку.

КАПІТА́Л (лац. capitalis галоўны), вартасць, якая праз эксплуатацыю наёмных рабочых дае прыбавачную вартасць; эканам. катэгорыя капіталіст. спосабу вытворчасці. К. Маркс паказаў, што К.— не рэч, а грамадска-вытворчыя адносіны паміж класам капіталістаў і класам рабочых. Самі па сабе сродкі вытворчасці і грошы не з'яўляюцца К., а ператвараюцца ў К., калі выкарыстоўваюцца для эксплуатацыі наёмных рабочых і прысваення прадуктаў іх працы. У працэсе вытворчасці на капіталіст. прадпрыемстве рабочы стварае вартасць, большую за вартасць яго рабочай сілы,— *прыбавачную вартасць*, якая прысвойваецца капіталістам. Павелічэнне вартасці эксплуатацыяй наёмных рабочых ператварае яе ў К.

Як эканам. з'ява К. узнік у дакапіталіст. фармацыях у выглядзе *ліхвярскага капіталу* і *гандлёвага капіталу*. Але пануючае становішча К. займае, калі ўзнікае *прамысловы капітал* і на прынцыпах К. ажыццяўляецца вытворчасць. Гэта адбываецца на стадыі таварнай вытворчасці, калі таварам становіцца *рабочая сіла* і рабочыя, пазбаўленыя сродкаў вытворчасці, мусяць прадаваць яе капіталістам. Першапачаткова К. выступае ў выглядзе пэўнай сумы грошай. У капіталіст. вытворчасці грошы становяцца К. у выніку куплі сродкаў вытворчасці, рабочай сілы, злучэння іх у працэсе вытворчасці і стварэння наёмнымі рабочымі прыбавачнай вартасці. Усеагульная формула К. $Г—Т—Г'$, дзе $Г$ — грошы, неабходныя для працэсу вытворчасці, $Т$ — новы тавар, $Г'=Г+\Delta Г$ — грошы, атрыманыя пры рэалізацыі гэтага тавару; іх сума перавышае авансавую для вытворчасці суму грошай на велічыню прыбавачнай вартасці ($\Delta Г$). У залежнасці ад ролі асобных частак К. ў стварэнні вартасці тавару ён падзяляецца на *пастаянны капітал* і *пераменны капітал*. Пастаянны К.— частка К., якая затрачваецца на куплю сродкаў вытворчасці. Вартасць, неабходная для ўзнаўлення выкарыстаных сродкаў вытворчасці ў працэсе вырабу тавараў, пераносіцца на вартасць гэтых тавараў. Таму пастаянны К. не можа ствараць новай вартасці. Пераменны К.— частка К., якая выдаткоўваецца на куплю рабочай сілы. Рабочы, затрачваючы сваю працу, стварае новую вартасць, большую за тую, што капіталіст затраціў на куплю рабочай сілы. Значыць, гэтая частка К. ў працэсе вытворчасці зменьваецца, павялічваецца на велічыню прыбавачнай вартасці. Такім чынам, адзінай крыніцай прыбавачнай вартасці, капіталіст. прыбытку і ўсіх даходаў эксплуататарскіх класаў бурж. грамадства з'яўляецца неаплачаная праца рабочых. У працэсе капіталіст. ўзнаўлення адбываецца *кругаабарот* і *абарот капіталу*. Прамысловы К. праходзіць 3 стадыі, набывае і мяняе 3 формы: *грашовы капітал*, *прадукцыйны капітал* і *таварны капітал*. Паводле пераносу вартасці на гатовы тавар К. падзяляецца на *асноўны капітал* і *абаротны капітал*. Асноўны К.— частка прадукцыйнага К. (сродкі працы), якая поўнасцю ўдзельнічае ў працэсе вытворчасці і пераносіць сваю вартасць на новы выраблены тавар паступова, зношваючыся. Зношаная частка асн. К. робіць абарот у выглядзе перанесенай на тавар вартасці і вяртаецца да капіталіста ў грашовай форме, утвараючы фонд амартызацыі. Абаротны К.— частка прадукцыйнага К., вартасць якой на працягу вытворчага цыкла цалкам пераносіцца на выраблены тавар і разам з прыбавачнай вартасцю поўнасцю вяртаецца капіталісту пасля рэалізацыі тавару. У час кругаабароту прамысл. К. адбываецца адасабленне грашовага К. і ператварэнне часткі яго ў *пазыковы капітал*, а таварнага — у гандл. К. На аснове развіцця крэдыту ўзнікае *фіктыўны капітал*, які прадстаўлены не матэрыяльнымі каштоўнасцямі, а ка-

штоўнымі паперамі: акцыямі, аблігацыямі, закладнымі лістамі і інш. З развіццём капіталізму адбываецца *канцэнтрацыя і цэнтралізацыя капіталу*. У эпоху імперыялізму пры зрошчванні банкаўскага і прамысл. К. ўтвараецца *фінансавы капітал*, які забяспечвае эканам. і паліт. ўсеўладдзе *алігархіі фінансавай*. Найвышэйшая ступень К.— *дзяржаўна-манапалісты К.* (гл. *Дзяржаўна-манапалістычны капіталізм*). У сацыяліст. грамадстве, заснаваным на грамадскай уласнасці на сродкі вытворчасці, катэгорыі К. не існуе.

Літ.: Маркс К. Капітал, т. 1—3, Мн., 1952—53 (т. 1, раздз. 4—7; т. 2, раздз. 4, 8; т. 3, раздз. 1, 16, 21); Ленін У. І. Тры крыніны і тры састаўныя часткі марксізма, Тв., т. 19 (Полн. собр. соч., т. 23); яго ж. Карл Маркс, Тв., т. 21 (там жа, т. 26); Праграма Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Мн., 1961, ч. 1; Политическая экономия современного капитализма, т. 1, М., 1970, разд. 9, 16, 17. *Г. Ц. Кавалейскі.* Мінск.

КАПІТАЛІЗМ, апошняя эксплуататарская грамадска-эканамічная фармацыя, заснаваная на прыватнакапіталістычнай уласнасці на сродкі вытворчасці і эксплуатацыі наёмнай працы. «Пад капіталізмам разумеецца тая стадыя развіцця таварнай вытворчасці, калі таварам становяцца ўжо не толькі прадукты чалавечай працы, але і самая рабочая сіла чалавека» (Ленін У. І. Тв., т. 1, с. 79). Навук. абгрунтаванне заканамернасцей узнікнення, развіцця К. і пераходу ад К. да сацыялізма дадзена ў працах К. Маркса, Ф. Энгельса і У. І. Леніна. Асноўны эканам. закон развіцця капіталіст. грамадства — вытворчасць і прысваенне прыбавачнай вартасці (гл. *Асноўны эканамічны закон капіталізму*). Характэрныя рысы К.— анархія вытворчасці, цыклічнасць развіцця, беспрацоўе, абсалютнае і адноснае абяднение пралетарыяту і інш.

Капіталіст. грамадскія адносіны ў Зах. Еўропе зарадзіліся пры распадзе феадалізму ў пач. 16 ст. (элементы К. спарадычна паяўляліся ў гарадах Італіі, у Нідэрландах у 14—15 ст.), калі натуральная гаспадарка пачала ператварацца ў простую таварную (гл. *Таварная вытворчасць*), а апошнял — у капіталістычную. На аснове новых грамадскіх адносін з дробных рамеснікаў і гандляроў паступова сфарміраваўся клас буржуазіі, які ўсё больш шырока выкарыстоўваў *наёмную працу*, сканцэнтраваў у сваіх руках вытворчасць у гарадах, гандаль і банкі. Простая капіталіст. кааперацыя замяняецца *мануфактураю*. Пазбаўленне дробных вытворцаў (перш-наперш *сялянства*) сродкаў вытворчасці і ўтварэнне буйной капіталістычнай уласнасці — сутнасць *першапачатковага накаплення капіталу*. У гістар. развіцці К. праходзіць дзве стадыі: даманапалістычную і манапалістычную. Даманапаліст. стадыі ўласцівы свабодная канкурэнцыя і бурж. дэмакратыя. З пераходам да машыннай вытворчасці, якая мяняе змест і характар працы (гл. *Прамысловы пераварот*), узмацняецца *аграмаджванне вытворчасці*, рост накаплення капіталу, яго канцэнтрацыя і цэнтралізацыя, а ў сувязі з гэтым абвастраюцца антаганістычныя супярэчнасці К. Прамысловасць аддаляецца ад с. гасп., растуць вял. гарады. Развіццё вытворчасці на першай стадыі К. выклікала змену грамадскіх адносін, сац. структуры. Сфарміраваліся новыя грамадскія класы: *буржуазія*, пралетарыят (гл. *Рабочы клас*) і сац. слой — *інтэлігенцыя*. Панаванне буржуазіі ў эканоміцы, культуры, бясправ'нае становішча пралетарыяту, рост эксплуатацыі абвастраюць класавыя адносіны, усе сац. супярэчнасці і перш-наперш супярэчнасці паміж грамадскім характарам вытворчасці і прыватнакапіталістычнай формай прысваення прадуктаў вытворчасці (гл. *Асноўная супярэчнасць капіталізму*), паміж працай і капіталам, паміж рознымі капіталіст. групоўкамі і інш. Абвастраецца класавая барацьба ў капіталіст. грамадстве (гл. *Класы і класавая барацьба*). Ужо ў даманапаліст. перыяд рабочы клас выступае як новая паліт. сіла. У Францыі, Германіі, Англіі ў 1-й пал. 19 ст. адбыліся масавыя выступленні пралетарыяту, у выніку якіх устаноўлены нармаваны рабочы дзень, створана рабочая інспекцыя, заснаваны партыі рабочага класа.

Расія ўступіла на шлях капіталіст. развіцця пазней, чым краіны Зах. Еўропы. Развіццё К. ў Расіі адбывалася паводле тых жа эканам. законаў, што і ў інш. краінах. Разам з тым яно мела і свае асаблівасці, глыбокі аналіз якіх дадзены ў працы Леніна «Развіццё капіталізму ў Расіі». На Беларусі капіталіст. адносіны зараджаюцца ў канцы 18—1-й пал. 19 ст. Але і пасля рэформы 1861 у Расіі, у т. л. і на Беларусі, рэшткі феадалізму былі яшчэ вельмі адчувальныя ў прамысловасці і с. гаспадарцы. Асн. частка зямлі засталася ў памешчыкаў. З-за аграрнай перанаселенасці многія сяляне займаліся адыходніцтвам, вялікая колькасць працаздольнага насельніцтва Беларусі выязджала за мяжу. У 80-я г. 19 ст. ў пяці вах. губернях адыходныя земляробчыя рабочыя складалі палову ўсіх адыходнікаў.

Развіццё К. ў прамысловасці адбывалася ў Беларусі больш марудна, чым у індустрыяльных раёнах Расіі. Нават у 1900 дробныя прадпрыемствы (да 15 рабочых) складалі 63,1% усіх прадпрыемстваў. Перавага с. гасп. ў эканоміцы, невялікія прадпрыемствы пераважна лёгкай прамысловасці, велізарная колькасць дробных саматкацкіх рамесных устаноў, значная ўдзельная вага рамесных рабочых — усё гэта характарызавала тэхніка-эканам. адсталасць Беларусі ў параўнанні з прамыслова развітымі раёнамі Расіі. Беспрацоўе, цяжкія жыллёвыя ўмовы, нясцерпныя ўмовы працы з'явіліся асн. прычынаю масавых выступленняў пралетарыяту Беларусі. Найбольш значнымі былі выступленні чыгуначнікаў Гомеля (1894), Віцебска (1893) і Мінска (1895).

Другая, манапал., стадыя К.— *імперыялізм* — гэта пераход К. да рэакцыі ва ўсіх галінах грамадскага жыцця. Ленін паказаў, што імперыялізм — гэта К., які памірае, эканам. і паліт. развіццё якога адбываецца нераўнамерна, што дае магчымасць перамогі сацыяліст. рэвалюцыі першапачаткова ў адной краіне. Імперыялізм вызначаецца ростам канцэнтрацыі і цэнтралізацыі вытворчасці, паяўленнем капіталіст. аб'яднанняў, якія належаць не адной асобе, а групе ўладальнікаў. Гэты працэс пачаўся ў апошняй трэці 19 ст. і не спыняецца ў наш час.

На мяжы 19—20 ст. Расія, у т. л. і Беларусь, уступіла ў перыяд манапал. К. З пач. 20 ст. ў прамысловасці і гандлі Беларусі павялічваецца роля банкаў. Акцыянерныя банкі мелі аддзяленні ва ўсіх губернскіх і ў многіх павятовых гарадах Беларусі. Так, у Мінску былі адкрыты аддзяленні Азоўска-Данскога камерцыйнага і Руска-Азіяцкага банкаў. Першы сіндыкат на Беларусі — Камітэт запалкавых фабрыкантаў Зах. краю — васн. ў чэрв. 1905 у Мінску пры аддзяленні Паўн. камерцыйнага банка. Бел. сіндыкаты былі нешматлікія і невялікія па колькасці фабрык. Канцэнтрацыя вытворчасці была значна ніжэйшая, чым у Расіі. Калі ў Расіі на прадпрыемствах з колькасцю рабочых больш як 500 чал. у 1913 было сканцэнтравана больш за палову рабочых (56,5%), то на Беларусі толькі 18,8% ад усіх рабочых прамысловасці. Амаль палова (48,7%) рабочых Беларусі была сканцэнтравана на прадпрыемствах з колькасцю рабочых 51—500 чал., а ў Расіі не больш трэці рабочых. Бел. манапал. аб'яднанні былі цесна звязаны з рускімі, большасць з'яўлялася іх структурнымі часткамі.

У 20 ст. адбываецца аб'яднанне не толькі асобных прадпрыемстваў, але цэлых канцэрнаў і банкаў унутры асобнай краіны і ў міжнар. маштабе. Свабодную канкурэнцыю замяніла панаванне манаполій. Аднак канкурэнцыя не знікае. У манапал. перыяд вядучыя імперыял. дзяржавы гвалтоўна захопліваюць і дзеляць паміж сабою азіяцкі і афрыканскі кантыненты. Манапал. буржуазія становіцца самай рэакц. сілай, якая процістаіць працоўным сваёй краіны і народам калан. краін. Манапал. стадыі развіцця К. характэрны зліццё бурж. дзяржавы з манаполіямі (гл. *Дзяржаўна-манапалістычны капіталізм*), дзярж. кантроль над замежным гандлем, перараэмеркаванне нац. даходу на карысць буржуазіі, падпарадкаванне працоўных манапал. капіталу. Растуць супярэчнасць паміж працаю і капіталам, анархія вытворчасці, узмацняюцца эканам. крызісы, галеча працоўных мас. Найважнейшая рыса гэтай стадыі развіцця К.— рост рабочых партый, перамога марксісцкай ідэалогіі ў рабочым руху, рост арганізаванасці і згуртаванасці пралетарыяту. Усё гэта прывяло ў Расіі да перамогі *Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі* і рэвалюцыі ў шэрагу краін свету, да стварэння магутнай сусв. сацыяліст. сістэмы, росту камуніст. руху і нац.-вызв. барацьбы каланіяльных і залежных народаў (гл. *Агульны крызіс капіталізму*). Дзяржаўна-манапалістычны К. дасягае асаблівага развіцця ва ўмовах вайны і мілітарызацыі эканомікі. К. на 2-й стадыі развіцця двойчы развязваў сусв. войны, у час якіх загінула больш як 50 млн. чалавек і якія затармазілі развіццё грамадства на дзесяткі гадоў. Страціўшы непадзельнае эканам., паліт. і ідэалаг. панаванне ў свеце, імперыялісты ўзмацняюць гонку ўзбраення, утрымліваюць велізарнейшыя арміі з ядз. зброяй, ствараюць ваен. і эканам. блокі, каб не дапусціць пашырэння сацыялізма і задушыць услякі прагрэс. рух, не спыняюцца нават і перад інтэрвенцыяй (як у Егіпце, В'етнаме, Лаосе, Камбоджы). Каб захаваць капіталіст. сістэму, якая няўмольна разбураецца, манапал. буржуазія ўмацоўвае дзяржаву, звяртаючыся часам да фашызму, ставіць па-за законам камуніст. партыі.

Імкнучыся замаскіраваць рэакц. і эксплуататарскі характар дзяржаўна-манапал. К. і даказаць, што дзяржаўна-манапал. К. азначае мірнае ўрастанне К. ў сацыялізм, бурж. эканамісты і сацыялагі выдаюць яго за нейкае «індустрыяльнае», «масавае грамадства» і да т. п. У галіне культуры назіраецца духоўнае абяднение бурж. гр-ва. Найважнейшыя сродкі пашырэння культуры і выхавання працоўных — радыё, кіно, тэлебачанне, друк — выкарыстоўваюцца манапал. буржуазіяй для прапаганды бурж. ідэалогіі. Рэфармісты, рэвізіяністы і інш. ідэолагі буржуазіі прыхарошваюць сучасны К., затушоўваюць яго рэакц. эксплуататарскую сутнасць. Гэта робіцца дзеля таго, каб абараніць і захаваць капіталіст. лад, які ажывае слабе.

Асаблівасць сучаснага К., як падкрэсліў XXIV з'езд Камуніст. партыі Сав. Саюза,— яго прыстасаванне да новых умоў у свеце. Баючыся, каб класавая барацьба не перарасла ў масавы рэвалюц. рух, буржуазія ўжывае больш замаскіраваныя формы эксплуатацыі працоўных, іншы раз ідзе на частковыя рэформы, каб утрымаць масы пад сваім ідэйным і паліт. кантролем. Манаполіі шырока выкарыстоўваюць дасягненні навук.-тэхн. прагрэсу, каб замацаваць свае пазіцыі, павялічыць эфектыўнасць тэмпаў развіцця вытворчасці, узмацніць эксплуатацыю працоўных. К. усім ходам свайго развіцця падрыхтоўвае ўмовы сваёй гібелі. Пераўтварэнне сацыялізма ў сусв. сістэму, распад каланіяльнай сістэмы паглыбілі агульны крызіс К. і сведчаць пра непазбежнасць яго поўнага краху.

Літ.: Маркс К. і Энгельс Ф. Маніфест Камуністычнай партыі, Мн., 1968; Маркс К. Капітал, т. 1—3, Мн., 1952—53; яго ж. Наёмная праца і капітал, Маркс К. і Энгельс Ф. Выбраныя творы, т. 1, Мн., 1951; яго ж. Да крытыкі палітычнай эканоміі, Мн., 1952; яго ж. Теории прибавочной стоимости, Маркс К. и Энгельс Ф. Соч., т. 26, ч. 1—2; Энгельс Ф. Анты-Дзюрынг, Мн., 1952; яго ж. Закон стоимости и норма прибыли, Маркс К. и Энгельс Ф. Соч., т. 25; Ленін У. І. Імперыялізм, як вышэйшая стадыя капіталізму, Тв., т. 22 (Полн. собр. соч., т. 27); яго ж. Развіццё капіталізму ў Расіі, Тв., т. 3 (там жа, т. 3); яго ж. Дзяржава і рэвалюцыя, Тв., т. 25 (там жа, т. 33); яго ж. Капіталізм у сельскай гаспадарцы, Тв., т. 4 (там жа, т. 4); Праграма Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Мн., 1961; Дакументы міжнароднай Нарады камуністычных і рабочых партый. Масква, 5—17 чэрв. 1969 г., Мн., 1969; Матэрыялы XXIV з'езду Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Мн., 1971; Капиталистический способ производства, ч. 1—3, М., 1959—62; Никитин С. М. Структурные изменения в капиталистической экономике, М., 1965; Проблемы генезиса капитализма, М., 1970; Проблемы политической экономии капитализма, М., 1969; Фигурнов П. К. Современный капитализм, М., 1964; Чепраков В. А. Государственно-монополистический капитализм, М., 1964; Саладков И. И. Социально-экономическое положение Белоруссии до Великой Октябрьской социалистической революции, Мн., 1957; Экономика Белоруссии в эпоху империализма, Мн., 1963; Липинский Л. П. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии, Мн., 1971; Шабуня К. И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905—1907 гг., Мн., 1962. *Г. П. Давідзюк.* Мінск.

КАПІТАЛІСТЫЧНАЯ ЎЛАСНАСЦЬ, гл. ў арт. *Прыватная ўласнасць, Дзяржаўны капіталізм.*

КАПІТАЛЬНАЕ БУДАЎНІЦТВА, гл. ў арт. *Будаўніцтва.*

КАПІТАЛЬНЫ РАМОНТ, від планавага рамонту асноўных фондаў: будынкаў, машын, рабочага абсталявання, інструменту. К. р. маральна ўстарэлых асн. фондаў спалучаецца з іх мадэрнізацыяй. Крыніцы затрат на К. р.— амартызацыйныя адлічэнні. Гл. таксама *Планава-папераджальны рамонт.*

КАПІТАЛЬНЫЯ ЎКЛАДАННІ, сукупнасць сродкаў, якія выкарыстоўваюцца ў сацыяліст. эканоміцы СССР для стварэння новых, рэканструкцыі і расшырэння дзейных асноўных фондаў вытворчага і невытворчага прызначэння (буд-ва аб'ектаў, набыццё машын, абсталявання, інвентару і інш.). Найважнейшая ўмова рэалізацыі дасягненняў навук.-тэхн. прагрэсу і забеспячэння высокіх тэмпаў расшыранага сацыяліст. ўзнаўлення. Утвараюцца за кошт фонду накаплення нац. даходу і амартызацыйных адлічэнняў. Гал. крыніцы фінансавання: сродкі дзярж. бюджэту; частка фондаў прадпрыемстваў і калгасна-каап. арг-цый; сродкі, дадзеныя Дзяржбанкам на доўгатэрміновы крэдыт, а таксама сродкі на-

сельніцтва. Планаванне К. у. ажыццяўляецца ў перспектыўных планах развіцця нар. гасп. і ў бягучых планах.

Каб забяспечыць хуткія тэмпы ўзнаўлення асноўных фондаў, аб'ём К. у. планамерна павялічваецца. У СССР у 1966—70 ён склаў 352 млрд. руб. (у цэнах 1969), амаль столькі, колькі ўкладзена за папярэднія 8 гадоў. На 1971—75 аб'ём К. у. запланаваны каля 500 млрд. руб., што прыкладна на 40% больш, чым у 1966—70. У БССР за 1966—70 К. ў. ў параўнанні з 1961—65 павялічыліся ў 1,7 раза. На 1971—75 іх аб'ём намечана павялічыць у 1,5 раза ў параўнанні з 1966—70. У залежнасці ад канкрэтных задач прапорцыі ў размеркаванні К. у. па галінах народнай гаспадаркі мяняюцца. Перыяд індустрыялізацыі патрабаваў хутка павялічыць удзельную вагу К. у. на развіццё вытворчасці сродкаў вытворчасці. Паводле рашэнняў XXIV з'езду КПСС, які гал. задачай 9-й пяцігодкі вызначыў істотнае павышэнне дабрабыту сав. людзей, расце ўдзельная вага К. у. на вытворчасць тавараў нар. спажывання, на развіццё с. гасп. Дзярж. К. ў. ў с. гасп. запланавана павялічыць больш як на 70%, у трактарнае с.-г. машынабудаванне прыкладна ў 2 разы, у лёгкую прамысловасць на 90%, у харч. і малочную на 60%. Усяго на развіццё с. гасп., на павелічэнне вытворчасці прадуктаў харчавання і тавараў нар. спажывання намечана накіраваць прыкладна 30% усіх К. у. У БССР на развіццё лёгкай прамысловасці прадугледжана выдаткаваць больш як 500 млн. руб., што ў 2 з лішнім разы вышэй за ўзровень 1966—70. Адна з гал. эканам. задач — павышэнне эфектыўнасці К. у., дасягненне на іх аснове найбольшага прыросту нац. даходу. Асн. шляхі вырашэння гэтай задачы: паляпшэнне якасці праектавання буд. аб'ектаў, далейшае развіццё буд. індустрыі, канцэнтрацыя К. у., скарачэнне тэрмінаў буд-ва, правільнае размяшчэнне прадукцыйных сіл, навук. арг-цыя працы і кіравання. Асабліва важнае значэнне набывае рэканструкцыя дзейных прадпрыемстваў, іх расшырэнне і тэхн. пераўзбраенне.

У капіталіст. краінах К. ў.— сродкі для ўзнаўлення асноўнага капіталу. Па галінах вытворчасці яны размяркоўваюцца стыхійна, пад уздзеяннем эканам. кан'юнктуры, што яшчэ больш паглыбляе дыспрапарцыянальнасць у эканоміцы гэтых краін.

Літ.: Красовский В. П. Проблемы экономики капитальных вложений в СССР, М., 1966; Чернявский В. О. Эффективная экономика, М., 1967; Хачатуров Т. С. Экономическая эффективность капитальных вложений, М., 1964.

Ф. А. Дронаў. Мінск.

КАПІТОНАЎ Іван Васілевіч [н. 10(23).2.1915, в. Сяроўскае Ялатамскага пав. Тамбоўскай губ.], савецкі парт. і дзярж. дзеяч, сакратар ЦК КПСС. З сялян. Чл. КПСС з 1939. Скончыў Маскоўскі ін-т інжынераў камунальнага буд-ва (1938); працаваў ст. інжынерам, нач. участка на буд-ве. З 1941 на кіруючай парт. і сав. рабоце. У 1951—52 сакратар, другі сакратар Маск. абкома, у 1952—54 першы сакратар Маск. гаркома КПСС. З 1954 першы сакратар Маск., з 1959 Іванаўскага абкомаў КПСС. У 1964 заг. аддзела ЦК КПСС. З 1965 сакратар ЦК КПСС. На XIX, XX, XXII—XXIV з'ездах КПСС выбіраўся чл. ЦК. У 1956—59 і 1964—66 чл. Бюро ЦК КПСС па РСФСР. Дэп. Вярх. Савета СССР 3—8-га скл. У 1954—62 чл. Прэзідыума Вярх. Савета СССР. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, 3 інш. ордэнамі, медалямі.



КАПІТУЛЯЦЫЯ (ад позналац. capitulo размаўляюся), спыненне супраціўлення адным з бакоў, што ваюе; здача асобных гарнізонаў, акружаных груповак або ўсіх узброеных сіл дзяржавы на ўмовах, прадыктаваных пераможцам або ўзгодненых перагаворамі.

Адзін з відаў К.— безагаворачная; азначае прызнанне поўнага разгрому і перадачу пераможцу ўсяго ўзбраення і тэхнікі ў якасці трафеяў, а таксама поўнага складу ў якасці палонных. Напр., у 1945 гітлераўская Германія і мілітарысцкая Японія падпісалі акты пра безагаворачную К. ў выніку разгрому іх у 2-й сусв. вайне. К. агрэсіўных дзяржаў выкарыстоўваецца для ўсталявання трывалага міру і папярэджання паўтарэння агрэсіі з боку дзяржавы, што капітулявала. К. перад агрэсарам садзейнічае ўмацаванню агрэсіўнай дзяржавы, а таму народы не абавязаны выконваць яе ўмовы (напр., К. петэнаўскага ўрада Францыі і ўрадаў інш. капіталіст. краін у 1940 перад фашысцкай Германіяй).

КАПІТЭЛЬ (ад лац. capitellum галоўка), у архітэктуры — верхняя частка *калоны*, пілястры. Гл. *Ордэры*.

КАПІЦА Пётр Леанідавіч [н. 26.6(8.7).1894, Кранштат], савецкі фізік. Акад. АН СССР (1939, чл.-кар. 1929). Герой Сац. Працы (1945). Скончыў політэхн. ін-т у Петраградзе (1918). У 1921—34 працаваў у Кембрыджскім ун-це (Вялікабрытанія). У 1935—46 і з 1955 дырэктар Ін-та фіз. праблем АН СССР. Першыя працы па вывучэнні іперцыі электронаў і ўласцівасцей радыеактыўнага выпрамянення. У 1924 стварыў устаноўку для работ са звышмагутнымі магн. палямі, з дапамогай якой вывучаў магн. ўласцівасці металаў, выявіў шэраг новых законаў і з'яў. Распрацаваў вадародны (1932), геліевы (1934) звадкавальнікі высокай прадукцыйнасці. Прапанаваў турбадэтандэры для атрымання нізкіх т-р і для звадкавання паветра, стварыў (1939) устаноўку для атрымання вялікіх колькасцей вадкага кіслароду. Вывучыў уласцівасці вадкага гелію II і адкрыў (1938) з'яву *звышцякучасці*. Ганаровы чл. навук. т-ваў і ўстаноў многіх краін. Дзярж. прэміі СССР 1941, 1943. Узнаг. 3 ордэнамі Леніна, ордэнам Працоўн. Чырв. Сцяга, Залатым медалём імя Ламаносава.

Літ.: Добровольский Е. Н. Почерк Капицы, М., 1968; Алексеевский Н. Е. Петр Леонидович Капица, «Успехи физических наук», 1964, т. 83, в. 4 (бібліягр.).

КАПІЧ Мікалай Фёдаравіч (н. 15.8.1913, в. Шаенка Полацкага пав. Віцебскай губ.), беларускі савецкі гісторык. Канд. філас. н. (1962). З сялян. Чл. КПСС з 1943. Скончыў ВПШ пры ЦК КПСС (1953), Акадэмію грамадскіх навук (1957). З 1936 настаўнік на Віцебшчыне. З 1939 у Чырв. Арміі. Удзельнік савфінляндскай 1939—40 і Айч. вайнаў. З 1945 на парт. рабоце, з 1950 сакратар гаркома КП(б)Б. З 1951 у апараце ЦК КПБ—нам.

заг. аддзела прапаганды і агітацыі, заг. аддзела школ, заг. аддзела ВНУ і школ, заг. аддзела прапаганды і агітацыі, заг. аддзела навукі і культуры, заг. аддзела навукі і навуч. устаноў. З чэрв. 1969 дырэктар Ін-та гісторыі партыі пры ЦК КПБ. Аўтар прац па гісторыі партыі, навук. камунізме. Чл. рэд. калегіі «Нарысаў гісторыі Камуністычнай партыі Беларусі» (2 ч., 1967). Узнаг. 4 ордэнамі, медалямі.

Тв.: У. І. Ленін аб творчай актыўнасці мас у будаўніцтве камунізма, Мн., 1960; (разам з В. Дз. Марозавым) Сацыялізм і камунізм — дзве фазы развіцця камуністычнага грамадства, Мн., 1960; Идеологическая работа — могучая сила в борьбе за коммунизм, Мн., 1962; (разам з В. Дз. Марозавым) Выхавание новага чалавека, Мн., 1962; В творческой активности масс — залог торжества коммунизма, Мн., 1964.

КАПІШЧА (ад стараж.-слав. капь, кіпь — скульптура, ідал), культавае збудаванне ўсходніх і прыбалтыйскіх славян язычніцкага перыяду.



Рэканструкцыя свяцілішча Перуна ў Пярыні паблізу Ноўгарада.

У 1951 пры раскопках у Пярыні каля Ноўгарада знойдзены рэшткі слав. К. 10 ст., прысвечанага Перуну. Гэта круг дыяметрам 21 м, на якім у васьмі месцах гарэў агонь. У цэнтры стаяў драўляны ідал Перуна. Паводле падання каля Полацка на беразе Валовага воз. было К. Перуна і Бабы-лгі. Рэшткі свяцілішча 10 ст. адкапалі археолагі у 1969 каля в. Хадосавічы Рагачоўскага раёна.

КАПЛАН Лазар Майсеевіч [н. 17(30).7.1917, в. Скароднае Мазырскага пав. Мінскай губ.], Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1943. Скончыў артыл. вучылішча (1939). У Айч. вайну на Паўд.-Зах., Паўн.-Зах., 2-м Прыбалт. і 1-м Укр. франтах. Вызначыўся ў Латвіі. 18.7.1944 першы ўварваўся ў в. Ляўдэры Лудзенскага р-на, з групай разведчыкаў атакаваў і захапіў пераправу на р. Істранка. 19—20.7.1944 батарэя пад камандаваннем маёра К. ўперадзе сваіх парадкаў наблізілася да варожай абароны і прамой паводкай адбівала контратакі. 22.7.1944 знішчыла 5 варожых кропак. 27.7.1944 удзельнічаў у вызваленні г. Рэзекне. Жыве ў Варонежы.



КАПЛАНАЎКА, вёска ў Баравіцкім с/с Кіраўскага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр саўгаса «Бераснёўскі». За 12 *км* на ПнУ ад Кіраўска, 75 *км* ад Магілёва, 37 *км* ад чыг. ст. Бярэзіна, на аўтамаб. дарозе Магілёў — Бабруйск. 415 ж., двароў 117 (1971). Мех. майстэрня. Клуб, магазін.

КАПЛАНЦЫ, вёска ў Бярэзінскім р-не Мінскай вобл., на р. Клява (бас. Дняпра). Цэнтр сельсавета. За 10 *км* на ПдУ ад Бярэзіна, 113 *км* ад Мінска, 38 *км* ад чыг. ст. Стаялава, каля аўтамаб. дарогі Бярэзіно — Клічаў (2 *км*). 786 ж., двароў 242 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячыя яслі-сад, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Вёску двойчы (крас. 1943, ліп. 1944) часткова спалілі нямецка-фаш. захопнікі. Брацкая магіла 25 сав. воінаў грамадз. вайны, помнік на брацкай магіле 33 сав. воінаў Айч. вайны. На левым беразе Клявы ёсць гарадзішча культуры штрыхаванай керамікі. Каля К. 45 курганоў жал. веку.

КАПЛІНСКІ Васіль Тэлясфаравіч (1841, Мінская губ.— г. см. невяд.), удзельнік рэвалюц. руху 60-х г. 19 ст. З сям'і дробнага чыноўніка. Скончыў 2-і Маскоўскі кадэцкі корпус. З чэрв. 1860 вучыўся ў Артыл. акадэміі, актыўны ўдзельнік афіцэрскай рэвалюц. арг-цыі ў Пецярбурзе. З студз. 1861 служыў у 4-м стралк. батальёне (Варшава). Кіраўнік рэвалюц. гуртка ў батальёне і адзін з ініцыятараў стварэння *Камітэта рускіх афіцэраў у Польшчы*. У маі 1862 за рэвалюц. дзейнасць прыгавораны да 6 гадоў катаржных работ.

Літ.: Дьяков В. А. и Миллер И. С. Революционное движение в русской армии и восстание 1863 г., М., 1964.

Г. В. Кісялёў. Вільнюс.

КАПЛІЦА, хрысціянская культавая пабудова, невялікая царква без алтара. Ставілася на плошчах, скрыжаваннях дарог на адзнаку якой-н. падзеі або на могілках як надмагільны помнік. На Беларусі вядомы барочныя капліцы св. Дамініка ў Слоніме (1745) і ў Дунайчычах каля Клецка (1760), К.-пахавальня кн. Паскевічаў у Гомелі (1889), К.-мемарыял каля в. Лясная Слаўгарадскага р-на Магілёўскай вобл. (1908, арх. А. Гаген; іл. гл. на ўкл. да арт. *Мемарыяльныя збудаванні*).



Капліца св. Дамініка ў Слоніме. 1745.

І. Дз. Белагорцаў. Брэст.

КАПЛІЧЫ, вёска ў Калінкавіцкім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Каплічы». За 33 *км* на ПнЗ ад Калінкавіч, 155 *км* ад Гомеля, на аўтамаб. дарозе, якая злучае вёску з Калінкавічамі. 939 ж., двароў 307 (1971). З-д травяной вітамінай мукі,

швейная і шавецкая майстэрні. Сярэдняя школа, б-ка, дзіцячыя яслі-сад, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, сталовая, магазін. Помнік на брацкай магіле 341 сав. воіна і партызана Айч. вайны.

КАПРАЛАКТА́М (ε-капралактам), арганічнае рэчыва з класа *гетэрацыклічных злучэнняў*; унутраны цыклічны амід ε-амінакапронавай кіслаты.

К.— белыя крышталі з *t* пл. 69 °С, *t* кіп. 262,5 °С, добра растваральнікаў. Атрымліваюць пераважна з бензолу. Пры награванні ў прысутнасці шэрагу агентаў (вады, спірту, амінаў і інш.) К. палімерызуецца, утвараючы поліамідную смалу, з якой атрымліваюць валакно капрон. К. выкарыстоўваецца таксама ў вырабе розных поліамідных пластыкаў, падае ім растваральнасць і эластычнасць. У БССР К. вырабляюць на *Гродзенскім хімічным камбінаце*. Гл. таксама *Поліамідныя валокны*.

КАПРО́Н, гл. ў арт. *Поліамідныя валокны*.

КАПРЫЧЬЮ (італьян. capriccio літар. капрыз, прыхамаць), **капрыс** (франц. caprice), інструментальная п'еса свабоднай будовы, віртуознага характару, з вычварнай зменай кантрастных вобразаў і настрояў.

Вядомы 24 К. для скрыпкі сола Н. Паганіні (блізкія да этюдаў), фп. К. І. Брамса, для сімф. аркестра — «Італьянскае капрычыо» П. Чайкоўскага, «Іспанскае капрычыо» М. Рымскага-Корсакава. У бел. музыцы пазву «Капрычас» і адпаведны характар мае канцэрт для фп. з арк. С. Картэса.

КАПТА́Ж (франц. captage захопліванне), збудаванне для забору падземных водаў на водазабеспячэнне, абводненне і інш.

К. грунтавых водаў у горных краінах ажыццяўляецца штольнямі, галерэямі, каптажнымі каналамі, дрэнажнымі трубамі; на раўнінай мясцовасці — шахтавымі калодзежамі, свідравінамі. Афармленне натур. выхаду вады называюць К. крыніцы.

КАПТУР, жаночы галаўны ўбор. Шапачка з завязкамі пад падбародкам. Шылі звычайна з фабрычнай чорнай ці чырв. матэрыі: шэрсці, шоўку, паркалю, атласу. Святочныя К. ўпрыгожвалі брыжамі, стужкамі, пацеркамі, вышыўкаю. На пач. 20 ст. К. заменены хусткай. Як галаўны ўбор старых жанчын захаваўся ў цэнтр. і паўн.-зах. раёнах Беларусі да 50—60-х г. 20 ст.

КАПТУР Анатоль Аляксандравіч (н. 18.2.1947, в. Слабада Мінскага р-на), беларускі савецкі спартсмен, майстар спорту міжнар. класа (1969) па веславанні на байдарках. Скончыў Бел. ін-т фіз. культуры (1970). Чэмпіён Еўропы (1969, Масква) па веславанні на байдарцы-адзіночцы ў эстафеце 4×500 *м*. Чэмпіён СССР (1970) на байдарцы-адзіночцы на дыстанцыі 500 *м* і ў эстафеце 4×500 *м*. Шматразовы прызёр міжнар. спаборніцтваў. З 1970 у Сав. Арміі.

КАПТУРОВЫ СУД, часовая надзвычайная ўстанова ў сярэдневяковых феад. дзяржавах, якая дзейнічала ў час бескаралеўя, каб адзін-сяць правасуддзе па найбольш важных справах. На Беларусі першыя К. с. ствараліся паводле пастановы сейма Вял. кн. Літ. ад 29.1.1587.

У склад К. с. ўваходзілі ваявода або павятовы староста ці іх намеснікі, суддзя і пісар замкавага суда, падкаморы. суддзя, падсудак і пісар земскага суда. К. с. лічыўся правадзейным, калі прысутнічала не менш як 5 асоб з яго складу. Пастановы К. с. па большасці спраў былі канчатковыя, і апеляцыйныя скаргі на іх не прымаліся. Дзейнасць К. с. была накіравана на хуткае задушэнне класавай барацьбы працоўных.

Кр.: Акты, издаваемые Виленскою археографическою комиссиею, т. 3, Вильна, 1870.

І. А. Юхо.

КАПУСТА (Brassica), 1) род раслін сям. *крыжакветных*. Да яго належыць агародніна-гарчыца. 2) Група адна- і двухгадовых агародніннных раслін — уласна капуста. Важная



Капуста: *1* — кальрабі (Венская белая 1350); *2* — брусельская (Геркулес); *3* — белакачанная (Скараспелка 3).

харчовая і кармавая культура. Паходзіць ад дзікай К., якая расце ў прыморскіх раёнах Зах. Еўропы і Міжземнага м. У выніку шматвяковай культуры, гібрыдызацыі і адбору створана многа відаў, падвідаў і разнавіднасцей К.: белакачанная, чырвонакачанная, брусельская, савойская, цвятная, кальраві, ліставая, пекінская, кітайская.

К. мае вугляводы, бялкі, мінер. солі (калію, фосфару, кальцыю); багатая на каратін, вітамін С, А, B_1, B_2, B_3, РР. К. дыятычныя ўласцівасці К. выкарыстоўваюцца ў медыцыне. На Беларусі найб. гасп. значэнне мае К. белакачанная (*B. capitata*), займае каля 40% пл. агародніннных культур. Двухгадовая расліна: ва першы год фарміруе верхавінкавую пупышку, якая разрастаецца ў качан, на другі — суквецці, плады і насенне. Холадаўстойлівая, святло- і вільгацелюбная культура. Добра расце ва ўмераным вільготным клімаце, патрабуе ўгноеных глебы. Дае высокія ўраджаі (да 1000 ц/га) пры нізкім сабекошце прадукцыі; мае шмат сартоў, розных па скараспеласці, ўтылізацыі і прызначэнні. Асн. раянаваныя сарты: ранеспелыя — Скараспелка 3, Нумар першы грыбаўскі 147; сярэднеранні — Лошыцкая 96; сярэднеспелы — Слава 1305; сярэднепозняя — Юбілейная 29, Беларуская 85, Падарунак 2500; познаспелы — Амагер 611. Скараспелка, Лошыцкая, Юбілейная і Беларуская — сарты селекцыі Бел. НДІ садоўніцтва, агародніцтва і бульбы. Для тарфяна-балотных глеба́ў найлепшыя сарты — Беларуская 85, Амагер 611 і Падарунак 2500. З інш. відаў К. на Беларусі вырошчваюць цвятную (сарты Айчынная, Сняжынка, Маскоўская кансервавая), чырвонакачанную (сарты Каменная галоўка, Гако), кальраві (Венская белая 1350), пекінскую (Хібінская ПАУПР). Іл. гл. таксама на ўкл. да арт. *Вітамінаносныя расліны*.

Літ.: Лизгунова Т. В. Капуста. Л., 1965; Пути повышения урожайности овощных культур. Мн., 1967; Чулкова Е. І. Капуста. Мн., 1954.

Л. І. Чулкова, М. А. Гарадзілаў.
Самахвалавічы, Мінскі р-н.

КАПУСТА Піліп Піліпавіч (н. 25.12.1907, с. Жоўтае Верхнедняпроўскага пав. Екацярынаслаўскай губ.), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху ў Мінскай і Беластоцкай абл. у Айч. вайну. Ген.-м. (1943).

З сялян. Чл. КПСС з 1932. Скончыў металургічны тэхнікум, Харкаўскае ваен.-артыл. вуч. (1934). У 1924—31 рабочы чыг. ст. Зялёная, у Днепрадзяржынску. З 1931 у Чырв. Арміі. Удзельнік вызвалення Зах. Беларусі (1939), сав.-фінляндскай вайны 1939—40. З чэрв. 1941 на фронце — камандзір палка. У партызанах з сак. 1942 — нач. штаба, камісар атрада; з мая 1942 камандзір партыз. брыгады імя К. Я. Варашылава Мінскай вобл., з снеж. 1942 камандзір Слуцкага партыз. злучэння. З мая 1943 у распараджэнні ЦШПР. З жн. 1943 нач. штаба партыз. руху ў Беластоцкай вобл., адначасова чл. падпольнага абкома КП(б)Б. Пасля вайны ў Сав. Арміі. Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі.

КАПУСЦІН Міхаіл Данілавіч [5(18).11.1907, в. Мікулічы Бабруйскага пав. Мінскай губ.— 8.2.1968], Герой Сав. Саюза (1945). З сялян. Чл. КПСС з 1941. У Айч. вайну з сак. 1942 на Волхаўскім і 3-м Укр. франтах. Вызначыўся 10—11.5.1944. Пасля ранення камандзіра батальёна і яго намесніка прыняў на сябе камандаванне батальёнам. Байцы падраздзялення 2 дні адбівалі варожыя атакі на зах. беразе Днястра каля Цірaспаля, знішчылі і падбілі 23 танкі і самаходныя гарматы. Удзельнік вызвалення Варшавы і баёў за Берлін.



КАПУЦКІ Андрэй Рыгоравіч (парт. псеўд. Лёкса, Хвастоў, літ. псеўд. Язэп Пралеска; 1897, Маладзечна — 1935), дзеяч рэвалюц. руху ў Зах. Беларусі. З сялян. Чл. КПЗБ з 1923. Скончыў Маладзечанскую семінарыю, Камуністычны ун-т Беларусі (1929). Удзельнік грамадз. вайны. За рэвалюц. дзейнасць у 1920 зняволены польск. акупантамі ў мінскую турму. Адзін з заснавальнікаў *Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі* (БРА), разам з якою ўступіў у КПЗБ (снеж. 1923) і кааптаваны ў ЦК КПЗБ. Належаў да *сэўсеці*, але неўзабаве асудзіў яе. У 1925 арыштаваны польск. бурж. ўладамі і засуджаны на 10 гадоў турэмнага зняволення. 26.12.1926 амнісціраваны. З ліп. 1927 у СССР — супрацоўнік газ. «Звязда», час. «Полымя рэвалюцыі», дырэктар ун-та марксізма-ленінізма, заг. сектара друку ЦК КП(б)Б. Дэлегат падпольных II канферэнцыі і I з'езду КПЗБ. *Г. А. Каханоўскі.* Маладзечна.

КАПЦЁЎКА, вёска ў Гродзенскім р-не. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Капцёўскі». За 15 *км* на Пд ад Гродна, на аўтамаб. дарозе Гродна — г. п. Вял. Бераставіца. 385 ж., гасп. 112 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, дзіцячыя яслі-сад, аптэка, вет. пункт, аддз. сувязі, сталовая, 3 магазіны. У Вял. Айч. вайну ў вёсцы дзейнічала антыфаш. група, чл. якой распаўсюджвалі сав. лістоўкі, здабывалі партызанам зброю, разам з партызанамі рабілі дыверсіі на чыг. Гродна — Беласток. Брацкая магіла 51 сав. воіна Айч. вайны.

КАПЦЭВІЧЫ, вёска ў Петрыкаўскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета. Чыг. ст. на лініі Калінкавічы — Лунінец. За 21 *км* на ПнЗ ад Петрыкава, 191 *км* ад Гомеля. 1915 ж., двароў 588 (1971). Агародніпасушыльны з-д, цэх па перапрацоўцы драўніны, лясніцтва, швейнае атэлье. Прафес.-тэхн. вуч., сярэдняя школа, клуб, 2 б-кі, дзіцячы сад, бальніца, аптэка, аддз. сувязі, 2 сталовыя, 6 магазінаў. У вер. 1942, 1943 ням.-фаш. захопнікі загубілі 63 мірных жыхароў. Помнікі на 2 брацкіх магілах: 5 сав. воінаў грамадз. вайны, 35 сав. воінаў Айч. вайны.

КАПЦЭВІЧЫ, вёска ў Лучыцкім с/с Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр калгаса «XX партз'езд». За 52 *км* на ПнУ ад Петрыкава, 197 *км* ад Гомеля, 34 *км* ад чыг. ст. Пціч. 460 ж., двароў 163 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, магазін. Помнік на брацкай магіле 13 сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны.

КАПШЧЫНА (капшчына), падатак у Вял. кн. Літ., які браўся за гатаванне піва, мёду і гандаль гарэлкаю. Вядомы з 15 ст. *«Уставай на валокі»* 1557 вызначаўся памер К. з карчмы за мёд і піва па капе (60) грошаў, за гарэлку па 30 грошаў, з кожнага дыма па 2 пенязі. К. аставалася да 18 ст. і ў карал. гарадах, дзе быў уведзены спец. пі-цейны падатак — чопавы. *Я. М. Карпачоў.* Мінск.

КАПЫЛЕ́НКА Аляксандр Іванавіч [19.7 (1.8).1900, в. Краснагорка Канстанцінаградскага пав. Палтаўскай губ.— 1.12.1958], украінскі савецкі пісьменнік. Чл. КПСС з 1950. Сын чыгуначніка. Скончыў біял. ф-т Харкаўскага ін-та нар. асветы (1925). Друкавацца пачаў у 1920. Аўтар аб. апавяданняў «Цвёрды матэрыял...» (1928), «Залатая грамата» (1937), «Сонечная раніца» (1949), «Суседзі» (1955), аповесцей і раманаў «Вызваленне» (1930), «Дзесяцікласнікі» (1938), «Зямля вялікая» (1957) і інш. Адлюстроўваў жыццё сав. людзей у паслярэвалюц. гады, гераіку першых пяцігодак, Айч. вайны, пасляваен. буд-ва. Большасць твораў К. пра дзяцей і для дзяцей.

Тв.: Твори, т. 1—4, Київ, 1961—62; рус. пер.— Земля большая, М., 1962; Рождается город.— Лейтенанты, М., 1962.

Літ.: Килимник О. Олександр Копиленко, Київ, 1962. *В. А. Чабаненка.* Запорожжа.

КАПЫЛЬ, гар. пасёлак (з 1938), цэнтр Капыльскага р-на Мінскай вобл. За 125 *км* на ПдЗ ад Мінска, 9 *км* ад чыг. ст. Цімкавічы. 4,8 тыс. ж. (1971). Прамысл. прадпрыемствы: масласыраавод, раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі, прамкамбінат, камбінат быт. абслугоўвання. 2 сярэднія школы, муз. школа, 3 дзіцячыя сады, Дом культуры, 2 б-кі, бальніца. На брацкай магіле помнік 36 сав. воінам і партызанам Айч. вайны.

Упершыню ўпамінаецца пад 1274. З 20-х г. 14 ст. ў складзе Вял. кн. Літоўскага. З 1395 ва ўладанні Уладзіміра Альгердавіча, з 1612 — Радзівілаў, з 1832 належаў кн. Віттгенштэйну. З 1652 меў магдэбургскае права і герб. У 1506 пад К. літ.-бел. войскі разграмілі татараў. У 1695 каля К. адбыліся баі памiж атрадамі магнатаў Сапегаў і Радзівілаў за права валодання гарадам. Пасля 2-га падзелу



Капыль. Калгасная плошча.

Рэчы Паспалітай (1793) у складзе Расіі. мяст. Слуцкага пав. Мінскай губ. У рэвалюцыю 1905—07 тут дзейнічала *Капыльская арганізацыя РСДРП*. Сав. ўлада ўстаноўлена ў кастр. 1917. З чэрв. 1941 да 1.7.1944 акупаваны ням.-фаш. захопнікамі, якія загубілі 2915 жыхароў К.

КАПЫЛЬСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ РСДРП, утварылася не пазней мая 1905, у канцы года налічвала 115 чл. і спачувальных. Уваходзіла ў склад Паўн.-Зах. к-та (саюза) РСДРП. Мела сувязь з Мінскай арг-цыяй РСДРП, Абл. к-там Паўн.-Зах. саюза, Замежным бальшавіцкім цэнтрам. Трымалася бальшавіцкага кірунку. У маі 1905 выпусціла адозву да сялян з заклікам не плаціць падаткаў, не даваць рэкрутаў, патрабаваць спынення вайны з Японіяй. Адозва заканчвалася лозунгамі «Далоў самадзяржаўе!», «Няхай жыве сацыялізм!». У жн. 1905 выпусціла 2 лістоўкі, выкрывала Булыгінскую думу і ўказвала, што заваяваць свабоду можна толькі шляхам узбр. звяржэння самадзяржаўя. 8.10.1905 арг-цыя правяла мітынг рабочых і рамеснікаў Капыля, 17 кастр. ўсеагульную паліт. забастоўку і мітынг, 22—23 кастр. антыўрадавыя выступленні моладзі. 9.1.1906 паліт. дэманстрацыяй рабочых, рамеснікаў і сялян адзначана гадавіна «Крывавай нядзелі». Пазней К. а. РСДРП узначальвала забастоўкі працоўных, распаўсюджвала нелегальную л-ру. Накіроўвала дзейнасць Капыльскага валаснога к-та *Мінскай акруговай сялянскай арганізацыі пры РСДРП*. У лют. 1908 выпусціла і распаўсюдзіла рэвалюц. лістоўку «Да ўсіх жыхароў Капыля». Збірала сродкі на рэвалюц. мэты. Стварыла літ.-палітычны гурток «Самараавіццё і самаадукацыя», які выпускаў літ.-грамадскі рукапісны час. «Заря», з мая 1911 «Голос низа». Больш познія звесткі пра К. а. РСДРП адсутнічаюць.

У. В. Скарабагаты. Мінск.

КАПЫЛЬСКАЯ ГРАДА, паўд. адгалінаванне Беларускай грады на ПдЗ Мінскай і ПнУ Брэсцкай абласцей. З Нясвіжскай і Слуцкай раўнінамі складае фіз.-геагр. раён Зах.-Беларускай правінцыі. Паверхня сярэднеўзгорыстая (выш. да 242 *м* над узр. м.), складзена з марэны. Схілы парэзаны скразнымі далінамі, якія ўтварыліся ад сцёку ледавіковых водаў. Глебы дзярновыя моцнаападзоленыя на лёсападобных пародах або на марэнным суглінку. У далінах глебы дзярнова-балотныя і тарфяна-балотныя. Хваёва-яловыя і альхова-бярозавыя лясы. Пад ворнымі землямі 50—60% тэр. Асн. культуры: збожжавыя, бульба, лён, цукр. буракі. Карысныя выкапні: цагельная гліна, торф, мергель.

КАПЫЛЬСКАЯ КАНАВА, левы прыток канавы Морынскай (бас. Прыпяці). Даўж. 24 *км*. Знаходзіцца ў Салігорскім р-не Мінскай вобл. Водазбор (106 *км*²) у вярхоўі ўгорысты, далей — плоская, забалочаная, часткова аблесеная раўніна, пранізаная густой сеткай асушальных каналаў. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое.

КАПЫЛЬСКІ РАЁН, у складзе Мінскай вобл. Утвораны 17.7.1924. Размешчаны на ПдЗ вобласці. Пл. 1,6 тыс. *км*². Нас. 62,1 тыс. чал. (1971). Падзяляецца на 13 сельсаветаў. Цэнтр г. п. Капыль.

Рэльеф раёна пераважна раўнінны. З З на У раён перасякае *Капыльская града*. Карысныя выкапні: радовішча торфу Тур'л — 12,1 млн. т, 6 радовішчаў цагельнай сыравіны — 0,8 млн. м³ (у т. л. радовішча Наддаткі калля в. Гулевічы — 0,4 млн. м³); 3 радовішчы пясчана-жвіровага матэрыялу — 32,4 млн. м³ (у т. л. радовішча Скабін — 26,5 млн. м³); радовішча буд. пяску Пясочнае — 2,1 млн. м³. Сярэдняя т-ра студз. —6,2, ліп. 18,2 °С. Ападкаў 641 мм за год. Вегет. перыяд 194 дні. На Пн па граніцы раёна цячэ Нёман і яго прытокі Лоша з Выняй і Тур'л, на Пд Морач (прыток Случы) з прытокам Мажа. Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (65,5%), у т. л. залішне ўвільготненыя (10,6%), дзярнова-падзолістыя глеяватыя (4,3%), дзярнова-падзолістыя глеевыя (3,6%), дзярнова-балотныя (11,3%), тарфяна-балотныя і алювіяльныя тарфяна-балотныя (15,3%). З мінер. глебаў 84,6% суглінкавых, 15,2 супясчаных, 0,2% пясчаных. Якасная ацэнка глебаў у балах: ворных зямель 55 (цана бала 0,27 *ц/га* збожжа), кармавых угоддзяў — 34, усіх с.-г. угоддзяў — 49. Пад лесам 18,8% тэрыторыі, пераважае хвоя, з лісцевых бяроза, вольха, асіна. Насяляюць раён беларусы, ёсць рускія, украінцы і інш. Сярэдняя шчыльн. 38,8 чал. на 1 *км*². Гар. нас. 7,7%.



Рэльеф раёна пераважна раўнінны. З З на У раён перасякае *Капыльская града*. Карысныя выкапні: радовішча торфу Тур'л — 12,1 млн. т, 6 радовішчаў цагельнай сыравіны — 0,8 млн. м³ (у т. л. радовішча Наддаткі калля в. Гулевічы — 0,4 млн. м³); 3 радовішчы пясчана-жвіровага матэрыялу — 32,4 млн. м³ (у т. л. радовішча Скабін — 26,5 млн. м³); радовішча буд. пяску Пясочнае — 2,1 млн. м³. Сярэдняя т-ра студз. —6,2, ліп. 18,2 °С. Ападкаў 641 мм за год. Вегет. перыяд 194 дні. На Пн па граніцы раёна цячэ Нёман і яго прытокі Лоша з Выняй і Тур'л, на Пд Морач (прыток Случы) з прытокам Мажа. Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (65,5%), у т. л. залішне ўвільготненыя (10,6%), дзярнова-падзолістыя глеяватыя (4,3%), дзярнова-падзолістыя глеевыя (3,6%), дзярнова-балотныя (11,3%), тарфяна-балотныя і алювіяльныя тарфяна-балотныя (15,3%). З мінер. глебаў 84,6% суглінкавых, 15,2 супясчаных, 0,2% пясчаных. Якасная ацэнка глебаў у балах: ворных зямель 55 (цана бала 0,27 *ц/га* збожжа), кармавых угоддзяў — 34, усіх с.-г. угоддзяў — 49. Пад лесам 18,8% тэрыторыі, пераважае хвоя, з лісцевых бяроза, вольха, асіна. Насяляюць раён беларусы, ёсць рускія, украінцы і інш. Сярэдняя шчыльн. 38,8 чал. на 1 *км*². Гар. нас. 7,7%.

З прамысл. прадпрыемстваў — райпрамкамбінат, масласырзавод, раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі, лясгас, камбінат быт. абслугоўвання (Капыль). Дзяржплемстанцыя (Васілеўшчына), механізаваны кар'ер (Скабін), харчкамбінат (Грозаў), спіртзавод (Цімкавічы), хлебапякарні (Капыль, Грозаў, Лясное, Цімкавічы), цагельня «Гулевічы», спецыялізаванае адда. Сельгастэхнікі (Чыжэвічы). У раёне 26 калгасаў, 6 саўгасаў і племзавод (1971).

Калгасы і іх цэнтры: «Авангард» *(Братхава)*, «Вальшавік» *(Жыліхава)*, «Беларусь» *(Праснакі)*, імя Войкава *(Бучаціна)*, «Гвардзеец» *(Кілевічы)*, імя Дзяржынскага *(Чырвоная Дуброва)*, «Інтэрнацыянал» *(Грозаў)*, «Іскра Леніна» *(Смалічы)*, «Кастрычнік» *(Садавічы)*, імя Леніна *(Камсамольская)*, «Ленінец» *(Мажа)*, «Новы свет» *(Русакі)*, «Памяць Леніна» *(Вялікая Раёўка)*, «1 Мая» *(Навасёлкі)*, «Піянер» *(Ванелевічы)*, «Прагрэс» *(Пацейкі)*, «Пралетарый» *(Душава)*, «Прапа» *(Руднае)*, «Праўда» *(Дзярэчына)*, «Радзіма» *(Канюхі)*, «Світанне» *(Скабін)*, «Семежава» *(Семежава)*, імя Суворава *(Камень)*, імя Ульянава *(Лешня)*, імя Цімірязева *(Быстрыца)*, «Шлях камуны» *(Прусы)*. Саўгасы і іх цэнтры: «Бабоўня» *(Бабоўня)*, «Доктаравічы» *(Новыя Доктаравічы)*, «Крыніца» *(Слабада-Кучынка)*, «Лясное» *(Лясное)*, «Прамень» *(Пясочнае)*, «Цімкавічы» *(Цімкавічы)*; племзавод імя Дзяржынскага *(Дусаеўшчына)*.

С. гасп. спецыялізуецца на малочна-мясной жывёлагадоўлі, ільнаводстве і буракасеянні; вырошчваюць бульбу і збожжавыя. Пад с.-г. ўгоддзямі 75% тэрыторыі. На пач. 1971 асушана 25,6 тыс. *га* забалочаных зямель. Агульная пасяўная пл. (тыс. *га*, 1970) 81,7, у т. л. пад збожжавымі і зернебабовымі 33,9, тэхн. (лён і цукр. буракі) 5,6, бульбай 13,0, пад кармавымі 28,6. На пач. 1971 было (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 70,7 (у т. л. кароў 32,8), свіней 75,7, авечак і коз 6,7. Тэр. раёна перасякаюць шашэйныя дарогі Бабруйск — Слуцк — Брэст, Асіповічы — Баранавічы і інш. На пач. 1971 у раёне 22 сярэднія, сярэдняя школа-інтэрнат, спец. школа-інтэрнат, 18 васьмігадовых, 89 пач. школ, 16 дашкольных устаноў, 70 масавых б-к, 88 клубных устаноў, 80 кінаўстановак (у т. л. 68 стацыянарных), 10 бальніц, 25 фельч.-ак. пунктаў. У раёне працуе (1971) 855 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, у т. л. 49 інжынераў, 63 аграномы, 41 заатэхнік, 32 вет. ўрачы, 602 настаўнікі, 49 урачоў; 1598 чал. з сярэдняй спец. адукацыяй. Раённая газ. «Слава працы».

В. П. Варанцова. Мінск.



Уборка пшаніцы ў калгасе «Шлях камуны».

КАПЫЛЬШЧЫНА, вёска ў Залескім с/с Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Зара». За 22 *км* на Пн ад Глыбокага, 222 *км* ад Віцебска. 211 ж., двароў 63 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, сталовая, 2 магазіны. Помнік сав. воінам-землякам, якія загінулі ў Айч. вайну.

КАПЫСКІ Зіновій Юльевіч [н. 6(19).1.1916, Віцебск], беларускі савецкі гісторык. Д-р гістар. н. (1968). З служачых. Чл. КПСС з 1945. Скончыў Мінскі ін-т нар. гасп. імя Куйбышава (1939). Працаваў у Мінскім аблпланаддзеле і Ін-це эканомікі АН БССР. Удзельнік Айч. вайны. З 1950 навук. супрацоўнік Ін-та гісторыі АН БССР. Навук. працы прысвечаны сац.-эканам. гісторыі гарадоў, развіццю грамадскай думкі на Беларусі ў 16—17 ст., бел. гістарыяграфіі. Адаіп з аўтараў пяцітомнай «Гісторыі Беларускай ССР» (т. 1, 1972), кніг «Полацк» (1962), «Гісторыя Мінска» (1967).

Тв.: Экономическое развитие городов Белоруссии в XVI — первой половине XVII в., Мн., 1966.

Цэнтральная сядзіба саўгаса «Прамень».



КАПЫТАЎ Сцяпан Логінавіч (1924, в. Брылінка Чэлябінскай акр. Уральскай вобл.— 29.9.1943), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). На фронце з 1943. Вызначыўся на тэр. Палескай вобл. 28.9.1943 у ліку першых фарсіраваў Дняпро і на працягу дня з ротай адбіў 9 варожых контратак. Загінуў у баі за плацдарм.

КАПЫ́ТКА, традыцыйная беларуская страва з бульбы. Таркаваную бульбу перамешваюць з бульбяною кашаю, дадаюць мукі, солі, соды, раскочваюць на тонкі блін, рэжуць на невялікія кавалкі і пякуць на змазанай тлушчам патэльні. Спечаную К. кладуць на 5—10 *мін* у падсолены кіпень або булён. Ядуць з малаком, маслам. Страва пашырана на З Беларусі.

КАПЫ́ТНІК (Calla), род травяністых раслін сям. ароідных. Пашыраны ў Паўн. і Сярэдняй Еўропе, Азіі, Паўн. Амерыцы. У СССР вядомы 1 від — К. балотны (C. palustris). На Беларусі нар. назвы: заечы бабоўнік, какочнік, пеўнікі, гуска.

Расліна выш. 15—30 *см* з паўзучым карэнішчам. Лісце стрэлкападобнае. Кветкі дробныя, сабраныя ў катах, абгорнуты белым покрывам. Плод ягадападобны, чырвоны. Расце пераважна ў лясах, на балотах, па берагах рэк і азёраў. Уся расліна ядавітая, мае сапанінападобнае рэчыва. Карэнішча багатае на крухмал. Добрая расліна для акварыумаў. Пад назвай «кала» ў цяпліцах вырошчваецца як дэкар. від К.— C. aethiopica. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Ядавітыя расліны*.

Літ.: Плященко С. И. и Бибиков Ф. П. Ядовитые и вредные растения, Мн., 1965.

КАПЭ́ЛА (α Возніка), самая яркая зорка (0-й зорнай велічыні) у сузор'і *Возніка*; другая па бляску зорка паўн. паўшар'я неба. К.— цесная падвойная зорка, што ўдалося ўстанавіць толькі з дапамогай інтэрферометра.

КАПЭ́ЛА (позналац. capella, італьян. cappella), 1) у архітэктуры — каталіцкая ці англіканская капліца ў выглядзе асобнага збудавання, прыбудоўкі да царквы ці ў самой царкве; спецыяльнае памяшканне ў замку, палацы і інш. Вядома К. Магілёўскага Іосіфаўскага сабора (1781—98; не збераглася). 2) У музыцы — калектыў харыстаў і інструменталістаў. Першапачаткова — хор пеўчых у каталіцкай царкве (месціўся ў капэле, адсюль назва; з прычыны чыста вак. складу сярэдневяковых К. харавыя спевы без інстр. суправаджэння атрымалі вызначэнне а капэла), пазней — мяшаныя вак.-інстр. калектывы (магнацкія К. ў 16—18 ст., напр., *Слонімская капэла Агінскага*). У СССР тэрмін ужываецца пераважна для абазначэння вял. хар. калектываў акад. тыпу (напр., *Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла БССР*), радзей — для інстр. калектываў асобнага складу (К. бандурыстаў). У некат. краінах К. называюцца сімф. аркестры (Дрэздэнская дзярж. капэла ў ГДР і інш.).

КАПЯРНІ́ЦКІ (Kopernicki) Ізідар (17.4.1825, в. Чыжоўка Звенігародскага пав. Кіеўскай губ.— 24.9.1891), польскі антраполаг, археолаг, этнограф. Правадз. чл. Кракаўскай АН (1887, чл.-кар. 1877). Скончыў мед. ф-т Кіеўскага ун-та (1849). Удзельнік паўстання 1863. З 1886 праф. антрапалогіі Ягелонскага ун-та. Арганізатар (1874, з Ю. Маерам) Антрапалаг. камісіі АН. Рэдактар (1877—91) час. «Zbiór wiadomości do antropologii krajowej» («Збор весцяў да антрапалогіі краёвай»), дзе змяшчаў шмат матэрыялаў па бел. фальклоры і этнаграфіі, сабраных З. Глогерам, У. Дыбоўскім, У. Вярыгам, Бірутай і інш. Перапісваўся з Ф. Багушэвічам. Аўтар многіх навуковых прац. Найб. значныя краніялагічныя даследаванні славян, цыганоў, айнаў, а таксама (супольныя з Маерам) — фізічных характарыстык галіцыйскіх палякаў, украінцаў, яўрэяў. Збіраў і публікаваў польскі фальклор.

Літ.: Godycki M. Sto lat antropologii polskiej, 1856—1956. Izydor Kopernicki, Wrocław, 1956; Karłowicz J. Izydor Kopernicki, «Wisła», 1891, t. 5.

І. У. Саламевіч. Мінск.

КАР (ням. Kar), цырк, чашападобная выемка ў верхняй частцы схілаў гор. Утвараецца ад марознага выветрывання паглыбленняў у горных пародах.

Плоскае днішча К. звычайна з бакоў і ззаду акружана стромкімі скалістымі сценкамі, з пярэдняга (вонкавага) краю К. адчынены ці замкнены невысокім парогам. Звычайна К. запоўнены ледавіком ці фірнам (калі яны размешчаны вышэй за снегавую лінію), сезоннымі скопішчамі снегу ці вадою (каравыя азёры).

КАРА́ ВЫВЕ́ТРЫВАННЯ, рыхлыя горныя пароды, утвораныя за кошт разбурэння і пераўтварэння на месцы першасных горных парод ад дзеяння паветра, вады і мікраарганізмаў (гл. *Выветрыванне*). К. в. змяшчаюць радовішчы жалеза, нікелю, хрому, марганцу, рэдкія і рассеяныя элементы, россыпы высакародных металаў, баксіты, керамічную і вогнетрывалую сыравіну і інш.

У залежнасці ад кліматычных і геал. умоў фарміруюцца розныя тыпы К. в.— латэрытныя, каалінавыя і інш. (гл. *Каалін, Латэрыт*). Вылучаюць плошчавую і лінейную К. в., якія пашыраны адпаведна на плошчы ці па шчылінных зонах, кантактах парод і інш. К. в. характэрная вертыкальная занальнасць мінер. саставу, якая вызначаецца паступовым пераходам (знізу ўверх) слабазмененых парод у глінападобную масу — найб. ступень змянення горных парод. На Беларусі К. в. развіта на пародах крышталь. фундаменту і асадкавага чахла. У адных мясцінах складзена з каалініту, у іншых — з мантмарыланіту і прымесяў гідраслюды, каалініту і хларыту.

Літ.: Лукашев К. И. Основы литологии и геохимии коры выветривания, Мн., 1958; Петров В. П. Основы учения о древних корах выветривания, М., 1967; Добровольский В. В. География и палеогеография коры выветривания СССР, М., 1969; Литология, геохимия и полезные ископаемые Белоруссии и Прибалтики, Мн., 1970, с. 83—89.

М. М. Лявых. Мінск.

КАРА́ ВЯЛІ́КІХ ПАЎША́Р'ЯЎ ГАЛАЎНО́ГА МО́ЗГУ, верхні слой вялікіх паўшар'яў галаўнога мозгу вышэйшых пазваночных жывёл і чалавека; вышэйшы аддзел *цэнтральнай нервовай сістэмы*. Утворана слоем шэрага рэчыва (таўшчыня 2—5 *мм*), які складаецца з нервовых клетак (10—15 млрд.), іх адросткаў (нервовыя валокны) і прамежкавай тканкі — неўрагліі (выконвае апорную, размежавальную, трафічную і ахоўную функцыі).

На паверхні кары — барозны і звіліны; яны значна павялічваюць плошчу шэрага рэчыва кары. У чалавека скрытая ў барознах частка кары па плошчы амаль удвая большая за бачную. У залежнасці ад спецыфічнай структуры і функцыі адрозніваюць палі кары (больш як 50) — коркавыя ядры (мазгавыя цэнтры), месцы вышэйшага аналізу і сінтэзу нервовых імпульсаў. Вядомы рухальныя, скурныя, слыхавыя, зрокавыя, нюхальныя, смакавыя і інш. цэнтры. Кара вялікіх паўшар'яў мае пэўную слаістую будову (архітэктоніку). Адрозніваюць 6 асн. слаёў: занальны (малекулярны), вонкавы зярністы, слой сярэдніх і вялікіх пірамід (пірамідны), унутраны зярністы, гангліёзны, слой паліморфных клетак. Колькасць і таўшчыня слаёў, гушчыня і форма нервовых клетак у розных палях неаднолькавыя. У кары выяўлены зорчатыя, верацёнападобныя, павукападобныя, гарызантальныя і пірамідныя нейроны. Шыр. іх 5—50 *мкм*, даўж.

10—130 *мкм*. Найб. тыповыя гіганцкія пірамідныя клеткі (клеткі Беца), размешчаныя ў 5-м слаі пярэдняй цэнтр. звіліны. Ад кожнага цела гэтых клетак адыходзяць кароткія адросткі — дэндрыты і адзін доўгі нейрыт (аксон), які дае пачатак рухальным праводным шляхам. Адросткі нервовых клетак ідуць у глыбіню мозгу і ўтвараюць яго нервова-валакністы кампанент — белае рэчыва, валокны якога па даўжыні, сувязях і функцыі падзяляюцца на злучальныя (асацыяцыйныя, звязваюць асобныя ўчасткі кары аднаго паўшар'я), спаечныя (камісуральныя, аб'ядноўваюць кару розных паўшар'яў), праекцыйныя (праваднікoвыя, звязваюць кару паўшар'яў з ядрамі ніжэйшых аддзелаў цэнтр. нерв. сістэмы — з падкоркавымі ядрамі, стваловай часткай галаўнога мозгу і ядрамі спіннога мозгу). Гл. таксама *Вышэйшая нервовая дзейнасць*.

Літ.: Павлов И. П. Полн. собр. соч., т. 3 (кн. 1—2), 2 изд., М.— Л., 1951; Саркисов С. А. Очерки по структуре и функции мозга, М., 1964; Никитенко М. Ф. Эволюция и мозг, Мн., 1969; Лурия А. Р. Высшие корковые функции человека и их нарушения при локальных поражениях мозга, 2 изд., М., 1969; Дельгадо Х. Мозг и сознание, пер. с англ., М., 1971; гл. таксама літ. пры арт. *Анатомія*.

А. Г. Лайкоў. Мінск.

КАРА́ РАСЛІ́Н, вонкавая частка сцябла і кораня раслін, аддзеленая ад цэнтр. часткі ўтваральнай тканкай — *камбіем*. Па кары перамяшчаюцца арган. рэчывы ад лісця да кораня, яна ахоўвае расліну ад неспрыяльных вонкавых умоў, у кары назапашваюцца пажыўныя рэчывы. З кары дуба, вярбы, елкі, вольхі і інш. атрымліваюць дубільныя рэчывы, з коркавага дуба — корак, з крушыны, каліны, хіннага дрэва — лекавыя рэчывы, з карычнага дрэва — карыцу, з лёну, канапель, джуту, канатніку — тэкстыльнае валакно.

Адрозніваюць першасную К. р.— складаецца пераважна з парэнхімных і мех. тканак, фарміруецца з вонкавай часткі конуса нарастання, і другасную К. р.— *луб*, утвараецца ў выніку дзейнасці камбію.

Літ.: Гл. пры арт. *Анатомія раслін*.

Р. Ц. Пратасевіч. Мінск.

КАРААБДЗІРАЧНЫ СТАНО́К, тое, што акорвальны станок. Гл. ў арт. *Акорванне драўніны*.

КАРАБА́Н Сцяпан Ігнатавіч [н. 26.12.1901 (8.1.1902), в. Дзехнаўка Мінскага пав.], беларускі савецкі літаратуразнавец. Д-р філал. н. (1960), праф. (1961). Чл. КПСС з 1924. З сялян. Скончыў БДУ (1931). Ст. навук. супрацоўнік Ін-та філасофіі АН БССР (1934—36), старшыня Саюза мастакоў БССР (1936—37), дацэнт (1937—41), з 1944 заг. кафедры рус. л-ры Мінскага пед. ін-та імя М. Горкага. Даследчык эстэт., філас. і крытычных поглядаў В. Бялінскага, творчасці Я. Купалы, гісторыі бел. сав. крытыкі.

Тв.: В. Г. Белинский. Его философские, эстетические и критические взгляды, Мн., 1936; Нарысы гісторыі беларускай савецкай крытыкі 20—30-х гадоў, Мн., 1971.

КАРАБЕ́ЛЬ (грэч. kárabos судна), у шырокім сэнсе — тое, што і *судна*. У ваенна-марской тэрміналогіі К.— баявыя судны ўсіх класаў (гл. *Карабель ваенны*). У касманаўтыцы К.— апарат для палёту ў космас (гл. *Касмічны лятальны апарат*).

КАРАБЕ́ЛЬ ВАЕ́ННЫ, узброенае самаходнае судна ў саставе ваенна-марскога флоту, прызначанае для ваенных дзеянняў на водных прасторах.

К. в. класіфікуюцца: у залежнасці ад асяроддзя, у якім дзейнічаюць,— на падводныя і надводныя; паводле прызначэння — на баявыя, спецыяльныя і дапаможныя. Падзяляюцца на класы, якія розняцца баявымі задачамі, узбраеннем і водазмяшчэннем: *падводныя лодкі, авіяносцы, крэйсеры, мінаносцы*, караблі процілодачнай і проціпаветр, абароны, дэсантныя, вартавыя, *катэры*, мінныя загараджальнікі, *тральшчыкі* і інш. Класы К. в. паводле спецыялізацыі, узбраення і тэхн. аснашчанасці падзяляюцца на падкласы і тыпы. Напр., крэйсеры падзяляюцца на падкласы ў залежнасці ад водазмяшчэння — цяжкі крэйсер, лёгкі крэйсер;

Уверсе: Ракетны крэйсер (злева). Ракетны катэр. Унізе: Процілодачны крэйсер (злева). Падводная лодка.









ад узбраення — ракетны, процілодачны (верталётаносец) і інш. Сучасныя К. в. абсталяваны магутнымі паравымі, дызельнымі, газатурбіннымі ці атамнымі ўстаноўкамі; маюць ракетнае, авіяц., артыл., тарпеднае, мінаае ўзбраенне; забяспечаны электронна-вылічальнымі прыладамі, сродкамі сувязі і сігналізацыі для аўтам. кіравання стральбою, караблеваджэння і інш. Ёсць К. в. на падводных крылах, на паветр. падушцы. Гл. таксама *Судна, Ваенна-марскі флот.*

Літ.: Сырмай А. Г. Корабль, М., 1967; Справочник по иностранным флотам, М., 1966; Крылов А. Н. Собр. трудов, т. 9 — Теория корабля, ч. 1—2, М.— Л., 1948—49; Шершов А. П. История военного кораблестроения с древнейших времен и до наших дней, М.— Л., 1940.

І. С. Ляпуноў. Масква.

КАРАБІН (франц. carabine), 1) баявая аблегчаная *вінтоўка* з кароткім ствалом. 2) Паляўнічая вінтоўка, з якой палююць на буйнога звера. 3) Кручок (зашчапка) з спружынавай часткай, якая адкрываецца ў сярэдзіну, у ланцужках, павадках і інш.

КАРАБЛЕБУДАЎНІЧЫЯ ІНСТЫТУТЫ, вышэйшыя навуч. ўстановы, якія рыхтуюць інжынераў па суднабудаванні і суднарамонце, суднавых сілавых установках, па турбінабудаванні, рухавіках унутранага згарання, парагенератарабудаванні, электраабсталяванні суднаў, па абсталяванні і тэхналогіі зварачнай вытворчасці, па тэхналогіі машынабудавання, металарэзных станках і інструментах, эканоміцы і арганізацыі маш.-буд. прамысловасці, па электронных выліч. машынах, гідраэрадынаміцы, аўтаматыцы, тэлемеханіцы.

У СССР у 1971/72 навуч. г. 2 К. і.: Ленінградскі (засн. у 1930) і Мікалаеўскі (з 1920). Навучанне дзённае, вячэрняе і завочнае; тэрмін навучання 5—6 гадоў, ёсць аспірантура. Ленінградскі караблебудаўнічы ін-т прымае да абароны канд. і доктарскія дысертацыі, Мікалаеўскі — канд. дысертацыі. Падрыхтоўка спецыялістаў па караблебудаўнічых спецыяльнасцях ажыццяўляецца таксама ў Ленінградскім, Горкаўскім і Новасібірскім ін-тах інжынераў воднага транспарту, Адэскім ін-це інжынераў марскога флоту, вышэйшых інж.-марскіх вучылішчах, Горкаўскім, Далёкаўсходнім і інш. політэхн. ін-тах.

КАРАБЛЁЎ Міхаіл Васілевіч (н. 24.1.1923, в. Баркіна Пашахонскага пав. Яраслаўскай губ.), беларускі савецкі вучоны ў галіне фармакалогіі. Д-р мед. н., праф. (1967). Чл. КПСС з 1944. Удзельнік Айч. вайны. У 1952 скончыў Яраслаўскі мед. ін-т. З 1960 заг. кафедры фармакалогіі Гродзенскага мед. ін-та. Асн. працы па вывучэнні ўплыву вытворных дытыякарбамінавай к-ты на арганізм жывёл. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

Тв.: Руководство по рецептуре, 3 изд., Мн., 1963; Производные дитиокарбаминовой кислоты, Мн., 1971.

КАРАБЫ 1-я, вёска ў Глыбоцкім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «XXII партз'езд». За 11 *км* на З ад Глыбокага, 211 *км* ад Віцебска. 264 ж., двароў 81 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, вет. пункт, аддз. сувязі, магазін. Помнік сав. воінам-землякам, якія загінулі ў Айч. вайну.

КАРАВАДЖА (Caravaggio; сапр. Мерызі) Мікеланджэла да (28.9.1573, Караваджа, прав. Ламбардыя — 18.7.1610), італьянскі жывапісец. Пачынальнік рэаліст. кірунку ў італьян. жывапісе 17 ст. Вучыўся ў Мілане, з пач. 90-х г. 16 ст. да 1606 працаваў у Рыме. Раннія работы К. («Вакх», 1592—93; «Юнак з кошыкам садавіны», «Лютніст», 1595) сведчаць пра вострую цікавасць мастака да рэальнага чалавека і прыроды. Творам уласціва падкрэсленая прадметнасць. Рэаліст. прыёмы бытавога жывапісу К. пераносіць і ў рэліг. сюжэты («Няверце Фамы», «Раскаянне Магдаліны»). Шэдэўры К.— вял. алтарныя карціны «Палажэнне ў дамавіну» (каля 1602—04) і «Смерць Марыі» (1605—06) — вызначаюцца строгай манументальнасцю, узнёсласцю і суровай праўдай вобразаў, моцнымі пачуццямі, пластычнай магутнасцю формаў, кантрастным святлоценем, чыстым каларытам. Вобразам людзей з народа К. надаў значнасць і маштабнасць. Рэліг. карціны атрымлівалі ў яго інтымна-псіхал. трактоўку («Адпачынак па дарозе ў Егіпет»). Стварыў адзін з першых нацюрмортаў у еўрап. жывапісе («Кошык з садавінаю», 1596). У позніх работах К. мацнелі рэаліст. тэндэнцыі, паглыбляўся трагізм светаадчування («Мадонна з пацеркамі», каля 1604—05; «Пахаванне св. Лучыі», «Адсячэнне галавы Іаана Хрысціцеля, абедзве 1608). Напісаў таксама вял. цыкл карцін з жыцця св. Матфея (1597—1600), «Распяцце Пятра» (1600) і інш. Мастацтва К. мела шмат паслядоўнікаў, т. зв. караваджыстаў. Іл. гл. на ўкл. IV да арт. *Італія.*



Літ.: Знаменская Т. Микельанджело да Караваджо, М., 1955; Микельанджело да Караваджо. М., 1960.

КАРАВАЕВА Ганна Аляксандраўна [н. 15(27).12.1893, Перм], руская савецкая пісьменніца. Чл. КПСС з 1926. Скончыла Вышэйшыя (жаночыя) Бястужаўскія курсы ў Петраградзе (1916). Гал. рэдактар час. «Молодая гвардия» (1931—38), карэспандэнт «Правды» на Урале (1941—43). Друкуецца з 1922. Аўтар аповесці «Двор» (1926, інсцэн. т-рам Я. Коласа пад назвою «Маёмасць», 1929), раманаў «Лесазавод» (1928), «Лена з Жураўлінага гаю» (1938), «Межы жыцця» (асобн. выд. 1963), трылогіі «Радзіма» аб працоўным подзвігу сав. народа ў Айч. вайну («Агні», 1943; «Разбег», 1946—48; «Родны дом», 1950; Дзярж. прэмія СССР 1951). Выдала кн. ўспамінаў «Вечназялёнае лісце» (1963), «Святло ўчарашняе» (1964; у ёй ёсць успаміны пра Я. Купалу), «Кніга, якая абышла ўвесь свет» (1970). Узнаг. ордэнам Леніна, 5 інш. ордэнамі, медалямі.

Тв.: Собр. соч., т. 1—5, М., 1957—58; бел. пер.— Двор, Мн., 1931; Лесазавод, пер. [С. Дарожнага], Мн., 1932.

Літ.: Русские советские писатели-прозаики. Биобиблиогр. указатель, т. 2, Л., 1964.

КАРАВАЕВА Тамара Георгіеўна [н. 20.(3.5).1916, Казань], руская і беларуская савецкая артыстка балета. Засл. арт. БССР (1949). Скончыла балетную школу пры Пермскім т-ры оперы і балета (1933), працавала ў Пермскім, Ерэванскім, Свярдлоўскім т-рах оперы і балета. У 1946—58 адна з вядучых салістак Бел. т-ра оперы і балета, выканала на яго сцэне партыі Надзейкі («Князь-возера» В. Залатарова), Адылі, Аўроры («Лебядзінае возера» і «Спячая красуня» П. Чайкоўскага), Марыі («Бахчысарайскі фантан» Б. Асаф'ева), Тао Хоа («Чырвоны мак» Р. Гліэра), Кітры («Дон Кіхот» Л. Мінкуса), Лізы («Марная засцярога» П. Л. Гертэля) і інш.

КАРАВАЕЎ Алег Мікалаевіч (н. 20.5.1936, Мінск), беларускі савецкі спартсмен, засл. майстар спорту СССР (1960) па класічнай барацьбе. У 1965 скончыў Бел. ін-т фіз. культуры. Чэмпіён XVII Алімпійскіх гульняў (Рым, 1960). Чэмпіён свету 1958 (Будапешт, Венгрыя) і 1961 (Іакагама, Японія). Шасціразовы чэмпіён СССР (1956—60, 1962). Працуе (1971) трэнерам у студэнцкім добраахвотным спарт. т-ве «Буравеснік». Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга.

КАРАВАЙ, вялікі круглы бохан, спечаны да якой-небудзь урачыстасці, вясельнае абрадавае печыва славянскіх народаў.

На Беларусі К. на вяселле пякуць знарок запрошаныя жанчыны — каравайніцы або родзічы маладых. К. упрыгожваюць фігуркамі з цеста, ягадамі, кветкамі, стужкамі, вянкамі. Працэс прыгатавання К. суправаджаецца абрадавымі песнямі, танцамі і іншымі цырымоніямі. Пад канец вяселля К. дзеліць сват і раздае гасцям. Кожны надзелены караваем вішнуе маладых і абдорвае іх.

КАРАВАЙКА (Plegadis falcinellus), птушка сям. ібісавых атр. галянастых. Пашырана на Пд Еўропы, Пд і ПдУ Азіі, у Аўстраліі, Амерыцы. У СССР на Пд Еўрап. часткі, у Казахстане, Сярэдняй Азіі. На Беларусі рэдкая залётная птушка.



Даўж. цела К. да 66 *см*, дзюбы да 15 *см*, маса 500—800 *г*. Апярэнне чырвона-карычневае з зеленавата-фіялетавым адценнем на спіне, крылах, хвасце. Канец дзюбы дугападобна загнуты. Ногі доўгія. Гняздуецца ў чаротавых зараснях, на дрэвах па берагах рэк і азёраў. Нясе 3—5 яец. Корміцца дробнымі беспазваночнымі.

Літ.: Федюшин А. В. и Долбик М. С. Птицы Белоруссии, Мн., 1967 (бібліягр.); Жизнь животных, т. 5, М., 1970.

КАРАВАЙНА, возера ў бас. р. Начы, левага прытока Зах. Дзвіны, у Полацкім р-не Віцебскай вобл. Пл. 0,63 *км*². Даўж. 1,8 *км*, найб. шыр. 0,6 *км*, сярэдняя 0,35 *км*. Катлавіна выцягнута з ПнУ на ПдЗ, схілы пакатыя, укрытыя лесам і хмызняком. Вадазбор (4 *км*²) дробнаўзгорысты. Сцёк з К. ў р. Быстрыцу. Водзяцца плотка, гусцяра, акунь, джгір, шчупак, лінь, карась.

КАРАВАЦІЧЫ, вёска ў Рэчыцкім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Запаветы Леніна». За 30 *км* на ПдЗ ад Рэчыцы, 66 *км* ад Гомеля, 12 *км* ад чыг. ст. Бабічы, каля аўтамаб. дарогі Гомель — Калінкавічы. 1882 ж., двароў 602 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, аддз. сувязі, магазін. У ліст. 1943 вёску часткова спалілі нямец.-фаш. захопнікі, загубілі 107 мірных жыхароў. Помнік на брацкай магіле 143 сав. воінаў Айч. вайны.

КАРАВЕЛАЎ Любен [каля 1834, г. Капрыўшціца — 21.1(2.2).1879], балгарскі пісьменнік, публіцыст і грамадскі дзеяч; пачынальнік крытычнага рэалізму ў балг. л-ры. З заможнай сям'і. У 1857—66 у Маскве, скончыў Маскоўскі ун-т. На светапогляд К. ўплывалі ідэі рус. рэвалюцыянераў-дэмакратаў. Друкаваўся з 1860. У Маскве выдаў на рус. мове «Помнікі народнага быту балгар» (кн. 1, 1861) і зб. твораў «Старонкі з кнігі пакут балгарскага племя» (1868). З 1867 у Бялградзе, піша на серб. мове — «Ці вінаваты лёс?» (1869) і інш. аповесці, якія зрабілі ўплыў на развіццё рэаліст. л-ры ў Сербіі. У кастр. 1869 з В. *Леўскім* выбраны ў Балгарскі рэвалюц. ЦК (БРЦК), які ўзначальваў у 70-я г. нац.-вызв. барацьбу балг. народа. Аўтар праграмы БРЦК. У 1869—74 выдаваў у Бухарэсце газ. «Свобода» (з люг. 1873 «Независимост») — орган балг. рэвалюц. эміграцыі, з 1875 час. «Знание». У 1872—75 узначальваў радыкальна-бурж. крыло БРЦК. У 1875 пасля паражэння антытурэцкага Старазагорскага паўстання адышоў ад паліт. дзейнасці. Аўтар аповесцяў «Пакутнік» (1870), «Ваявода» (1860), «Балгары старога часу» (1868) і інш., якія адлюстравалі сац. і нац. прыгнёт у Балгарыі і вызначаюцца рэвалюц. накіраванасцю, эмацыянальнасцю, каларытнасцю мовы. Некат. вершы К. сталі нар. песнямі. Перакладаў з рус. і ўкр. моў.

Тв.: Събрани съчинения в 9 тома, София, 1965—68; рус. пер.— Повести и рассказы, М., 1954.

Літ.: Воробьев Л. Любен Каравелов. Мировоззрение и творчество, М., 1963; Димитров М. Любен Каравелов. Биография, София, 1959.

Н. С. Гілевіч. Мінск.

КАРАВУЛЬНАЯ СЛУЖБА, асобая служба войск для аховы і абароны вайсковай маёмасці, баявой тэхнікі і інш. аб'ектаў, а таксама для аховы асоб, якія знаходзяцца на гаўптвахце. Для выканання гэтых задач назначаюцца каравулы.

КАРАГАНДА, горад, цэнтр Карагандзінскай вобл. Каз. ССР. Чыг. станцыя, вузел аўтамаб. дарог. 530 тыс. ж. (1971). Цэнтр Карагандзінскага вугальнага басейна. Вырас пасля 1931 у сувязі з індустрыялізацыяй краіны. Кам.-вуг. прамысловасць дае $^3/_4$ усёй прамысл. прадукцыі горада. Абагачальныя ф-кі. З-ды: машынабудаўнічы горнага абсталявання, Нова-Карагандзінскі машынабудаўнічы, па рамонце горнашахтавага і горнатранспартнага абсталявання, аўтарамонтны, электратэхнічных і сантэхвырабаў, ацяпляльнага абсталявання, металаканструкцый і інш. Вытв. буд. матэрыялаў (6 з-даў). Домабудаўнічы, рыбаховалодзільны і мясны камбінаты, абутковая, мэблевая, трыкатажная, кандытарская ф-кі, ЦЭЦ. Канал Іртыш — Караганда забяспечвае (з 1971) горад вадой. Ін-ты: політэхнічны, мед., 2 пед., кааператыўны; філіял Алма-Ацінскага ін-та нар. гаспадаркі. 7 сярэдніх

спецыяльных навучальных устаноў. Казахскі і рускі драматычныя тэатры, філармонія, краязнаўчы музей.

КАРАГАНДЗІНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ, у складзе Каз. ССР. Утворана 10.3.1932. Размешчана ў цэнтры Казахстана. Пл. 398,8 тыс. *км²*. Нас. 1590 тыс. чал. (1971). Падзяляецца на 10 раёнаў; 9 гарадоў, 32 гар. пасёлкі. Цэнтр г. Караганда.

К. в. займае большую частку *Казахскага драбнасопачніка*. На ПнЗ горы Улутау (выш. да 1133 *м*), на ПдЗ пяскі Прыаральскія Каракумы. Карысныя выкапні: кам. і буры вугаль, медныя і жал. руды, марганец, вальфрам, карунд, буд. матэрыялы і інш. Клімат рэзка кантынентальны. Зіма халодная, маласнежная з вятрамі і завеямі, лета гарачае і сухое. Сярэдняя т-ра студз. −17 на Пн, −14 на Пд; ліп. 19 на ПнУ, 26 °С на ПдЗ. Ападкаў 150 *мм* на Пд, 400 *мм* на Пн за год. Вегет. перыяд 160—200 дзён. Найб. рэкі Сарысу і Нура, на якой пабудавана Самаркандскае вадасх. У 1971 пачаў дзейнічаць канал Іртыш — Караганда. Азёры: Балхаш і многа невялікіх, пераважна салёных азёраў. Глебы на Пн цёмна-каштанавыя і каштанавыя пад кустова-разнатраўна-злакавым стэпам; гэта асн. раён земляробства. На Пд светла-каштанавыя і шэразёмныя глебы, значна засоленыя, характэрны палын і салянкі. Асн. насельніцтва казахі і рускія; жывуць таксама ўкраінцы, беларусы, татары і інш. Сярэдняя шчыльн. 4,0 чал. на 1 *км²*. Больш густа заселена паўн. ч. вобласці. Гарадскога нас. 81%. Найб. гарады: Караганда, Тэміртау, Балхаш, Сарань, Джэзказган.

Гал. галіны прамысловасці: горназдабыўная (здабыча кам. вугалю, рудаў чорных і каляровых металаў), чорная і каляровая металургія, маш.-буд. і хімічная. Карагандзінскі вугальны басейн забяспечвае палівам прадпрыемствы Казахстана, Сярэдняй Азіі і чорную металургію Урала. Здабыча і перапрацоўка рудаў каляровых металаў (Джэзказган, Акчатау, Саяк і інш.), здабыча марганцавай руды (Джэзды), жал. руды (Каражал), каляровая металургія (Балхаш, Джэзказган, Карсакпай), чорная металургія (Тэміртау). Машынабудаванне і металаапрацоўка: з-ды горнага абсталявання імя Пархоменкі і Нова-Карагандзінскі машынабудаўнічы, аўтарамонтны, па рамонце горнашахтавага і горнатрансп. абсталявання, электратэхнічных і сантэхвырабаў, металаканструкцый (Караганда), ліцейна-механічны (Тэміртау), рамонтна-механічны (Джэзказган, Караганда, Тэміртау). Хім. прамысловасць (з-д сінтэт. каўчуку). Коксахімія на металург. з-дзе (Тэміртау). Прадпрыемствы буд. матэрыялаў (Караганда, Джэзказган, Тэміртау, Балхаш, Сарань, Актау, Шахцінск). Харч. прамысловасць. ЦЭЦ у Карагандзе, Джэзказгане, Балхашы, Шахцінску, Каражале; у Тэміртау — Карагандзінская ДРЭС-1, у Абаі ДРЭС-2. На пач. 1971 у вобл. 132 саўгасы. Пад с.-г. ўгоддзямі 28,9 млн. *га*, з іх 25,9 млн. *га* пашы, 0,9 млн. *га* сенажацяў. Пасяўная пл. (тыс. *га*, 1970) 1975,7, у т. л. пад збожжавымі 1366,2 (яравой пшаніцай 1094,2), кармавымі 576,3, бульбай і агародніна-бахчавымі 23,5, тэхн. 9,7. Садоўніцтва. Жывёлагадоўля мяса-малочнага кірунку. На пач. 1971 было (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 485,3 (у т. л. кароў 192,4), свіней 63,5, авечак і коз 1913,9. Гадуюць коней і вярблюдаў. Асн. від транспарту — чыгункі. Даўж. 1586 *км* (1970). Гал. чыгунка Цалінаград — Караганда — Маінты — Чу з адгалінаваннем на Саяк, Карсакпай, Карагайлы, Тэміртау. Аўтамаб. дарог 7330 *км*. Суднаходства па воз. Балхаш. Ін-ты: політэхн., мед., пед., кааператыўны; 25 сярэдніх спец. навуч. устаноў. Каз. і рус. драм. тэатры, філармонія, 2 краязнаўчыя музеі. Абл. газеты: «Орталык Казакстан» («Цэнтральны Казахстан») і «Индустриальная Караганда».

Літ.: Индустриальное сердце Казахстана. Алма-Ата, 1968; Атлас Карагандинской области, М., 1969.



КАРАГАЧ, дрэва ці куст сямейства вязавых, тое, што *бераст*.

КАРАГОД (танок), від нар. масавай гульні, якая ўключае танец, харавыя спевы і элементы драм. дзеяння. Драм. і танц. сцэны звычайна ілюструюць тэкст песні. Найболей пашыраны ў славян.

К. бываюць адкрытыя і закрытыя, падвойныя і адзінарныя. Адны выконваюцца павольна, другія хутка, з прытанцоўваннем. Удзельнікі К. трымаюцца за рукі, часам за рагі хустачак. Узначальвае К. карагоднік ці карагодніца. Першыя звесткі пра бел. К. у летапісах 11 ст. Слова К. сустракаецца ў Ф. Скарыны. Выяўлены 76 тэкстаў бел. карагодных песень. Самыя стараж. К.— «А мы ляда капалі», «У Кіеве на плошчы ехаў князь Васіль», «Малады кароль гуляе». Найбольшая колькасць сюжэтаў — выбар маладога і маладой, праводзіны ў войска, сямейна-бытавы ўклад беларусаў. У беларускім К. адлюстраваны і гістарычныя падзеі. Цяпер карагодныя песні і танец выконваюцца прафесіяналамі і самадзейнымі калектывамі Беларусі.

Літ.: Карский Е. Ф. Белорусы, т. 3, [в.] 1 — Народная поэзия, М., 1916; Романов Е. Р. Белорусский сборник, т. 1, в. 3, Витебск, 1887; Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края, т. 1, ч. 1, СПб., 1887; Moszyński K. Kultura ludowa Słowian, t. 2, cz. 2, Warszawa, 1968, s. 365—386.

С. М. Міско. Мінск.

КАРАДЖАЛЕ (Caragiale) Іон Лука (30.1.1852, с. Хайманало Прахава нав.— 9.6.1912), румынскі



пісьменнік. Вучыўся ў Плаешцкай гімназіі, на курсе дэкламацыі і мімікі Бухарэсцкай кансерваторыі (1868—70). Працаваў суфлёрам і перапісчыкам у Бухарэсцкім нац. т-ры, школьным інспектарам (1881—83), дырэктарам Нац. т-ра ў Бухарэсце (1888—89). Зазнаў ганенне рэакц. ўрада і ў 1903 эміграваў (з 1904 у Берліне). Друкаваць фельетоны і народыі пачаў у 1873. У сатыр. камедыях «Бурная ноч» (1878, паст. 1879), «Пан Леаніда перад тварам рэакцыі» (1879), «Згубленае пісьмо» (паст. 1884), «Карнавальная карусель» (паст. 1885) паказаў глыбокі разлад паміж сваімі героямі і несправядлівым грамадскім ладам. З 1893 выдаваў 1-ю серыю сатыр. лістка «Moftul romîn» («Румынская лухта», 2-ю серыю выдаваў у 1901), дзе высмейваў пануючыя класы, выступаў супраць шавінізму і нацыяналізму. У зб. апавяд. «Моманты» (1901) паказаў абвастрэнне класавых супярэчнасцей рум. грамадства, духоўную дэградацыю буржуазіі. Аўтар брашуры «1907 год. Ад вясны да восені» (1907) пра сялянскія паўстанні ў Румыніі, зб. апавяд., нарысаў і фельетонаў «Заметкі і замалёўкі» (1892), «Кароткія апавяданні» (1897), «Новыя апавяданні» (1910). У 1949 пасмяротна выбраны ганаровым чл. Румынскай АН.

Тв.: Рус. пер.— Избр. произв., [т. 1—2], Бухарест, 1953—54; Избранное, М., 1953; Комедии, юморески, рассказы, М., 1963.

Літ.: Садовник Ш., И. Л. Караджале, Л.— М., 1964; Константиновский И. Караджале, М., 1970; Ион Лука Караджале, М., 1952.

І. У. Саламевіч. Мінск.

КАРАДЖЫЧ (Караџић) Вук Стэфанавіч (26.10.1787, с. Тржыч, Сербія — 26.1.1864), сербскі філолаг, фалькларыст, заснавальнік новай сербскай літ. мовы. Распрацаваў новы правапіс, заснаваны на фанет. прынцыпе, удасканаліў графіку. Аўтар «Сербскага слоўніка» (1818) — найб. поўнага збору нар. лексікі, зборнікаў нар. песень (1814—15, поўнае выд. ў 9 т., 1891—1902), граматыкі сербскай мовы (1814).

Літ.: Дмитриев П. А. Вук Стефанович Караджич, «Вестник ЛГУ», 1964, № 20, сер. истории, языка, литературы, в. 4; Ижевская М. Г. Вук Стефанович Караджич, «Известия АН СССР. Сер. лит. и языка», 1964, т. 23, в. 6.

КАРАЕДЫ (Scolytidae), сямейства *жукоў*. Каля 2000 відаў, пашыраны ва ўсіх частках свету, акрамя Антарктыды. У СССР каля 300 відаў. Шкоднікі лясоў, садоў, паркаў.

Цела К. цыліндрычнае, бурае або чорнае, даўж. 0,8—12 *мм*. Жукі і іх лічынкі прагрызаюць хады пад карою (радзей у кары і драўніне) аслабелых, ссечаных ці сухіх дрэў. На Беларусі найб. шкодзяць малы і вялікі хваёвы лубаеды (Blastophagus minor і B. piniperda), К.-тыпограф (Ips typographus). Меры барацьбы: выдаленне хворых дрэў і рэшткаў ад высечкі, высечка заселеных К. дрэў і здзіранне з іх кары.



Караед-тыпограф.

Літ.: Воронцов А. И. Лесная энтомология, 2 изд., М., 1967; Шевырев И. Загадка короедов, 3 изд., СПб., 1910; Фауна СССР. Жесткокрылые, т. 31 — Старк В. Н. Короеды, М.— Л., 1952.

Л. Ц. Крушаў. Гомель.

КАРАЕЎ Кара Абульфаз аглы (н. 5.2.1918, Баку), азербайджанскі савецкі кампазітар. Нар. арт. СССР (1959). Акад. АН Азерб. ССР (1959). Чл. КПСС з 1949.



Скончыў Маск. кансерваторыю (1946, клас Дз. Шастаковіча), з 1946 працуе ў Азерб. кансерваторыі (праф. з 1957). Найб. значныя творы: опера «Вэтэн» («Радзіма», з Дж. Гаджыевым, Дзярж. прэмія СССР 1946), балеты «Сем красунь» (1952, 2-я рэд. 1959), «Сцежкаю грому» (1957, 2-я рэд. 1958, Ленінская прэмія 1967; паст. ў Бел. т-ры оперы і балета ў 1960), 3 сімфоніі (3-я для камернага аркестра, 1965), сімф. паэма «Лейлі і Меджнун» (1947, Дзярж. прэмія СССР 1948), сімф. гравюры «Дон Кіхот» (1960), канцэрт для скрыпкі з арк. (1968), 24 прэлюдыі для фп. (1951—63). Дэп. Вярх. Савета СССР 5—6-га скл. Дзярж. прэмія Азерб. ССР імя Ахундава 1965. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.

Літ.: Карагичева Л. Кара Караев, М., 1960; яе ж. Кара Караев, М., 1968; Кара Караев. Библиография. Баку, 1969.

КАРАЗІЯ (лац. corrasio абточванне), механічнае дзеянне на горныя народы абломкавага матэрыялу, які рухаецца ад ветру, вады, лёду і інш.

Пры К. абточваюцца пяском агаленні горных парод у пустынях, згладжваюцца абломкі парод на схілах, у рэчышчах, паглыбляецца ложа ледавіка.

КАРАКАЛПАКСКАЯ АЎТАНОМНАЯ САВЕЦКАЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ РЭСПУБЛІКА (Каракалпакія), у складзе Узб. ССР. Утв. 16.2.1925 як аўтаномная вобл., з 20.3.1932 АССР. Размешчана на ПнЗ Узб. ССР, у ніжнім цячэнні Амудар'і. Пл. 165,6 тыс. *км²*. Нас. 723 тыс. чал. (1971). Падзяляецца на 12 раёнаў; 8 гарадоў, 8 гар. пасёлкаў. Сталіца г. Нукус. Канстытуцыя прынята III Надзвычайным з'ездам Саветаў Каракалп. АССР у кастр. 1936 і зацверджана Прэзідыумам ЦВК Узб. ССР 29.9.1937. Вышэйшы орган дзярж. улады — Вярх. Савет, выбіраецца на 4 гады, у перыяд паміж сесіямі — Прэзідыум Вярх. Савета рэспублікі. Вышэйшы выканаўча-распарадчы орган — Савет Міністраў. Мясц. органы дзярж. улады — раённыя, гарадскія, пасялковыя, кішлачныя і аульныя Саветы дэп. працоўных. Суд. сістэма: Вярх. суд Каракалп. АССР і раённыя нар. суды.

Прырода. Паверхня раўнінная з невял. ўзвышшамі. На ПдУ і У ўзгорыстая пустыня Кызылкум, на З плато Усцюрт выш. да 250 *м*, паміж імі даліна і дэльта Амудар'і. Карысныя выкапні: мінер. буд. матэрыялы, фасфарыты, руды каляровых металаў, тальк, графіт, солі, прыродны газ. Клімат



Крэпасць «Вялікая Кыркыз-кала» на ўскраіне пустыні Кызылкум.

рэзка кантынентальны з сухім гарачым летам і халоднай зімою. Сярэднял т-ра студз. ад —4,9 да —7,6; ліп. 23,6—28,2 °С. Ападкаў каля 110 *мм* за год. Рака Амудар'я багатая на рыбу і выкарыстоўваецца на арашэнне. Арашальныя каналы Кегейлі, Куаныщджарма і інш. Азёры: Аральскае м., Судочча і шмат дробных. Глебы ў даліне і дэльце Амудар'і шэраземна-лугавыя, такыравыя засоленыя, на Усцюрце шэра-бурыя пустынныя, такыры, салянчакі, у Кызылкумах і Усцюрце саксаул, палын і інш. Шмат паўзуноў, грызуноў, вадаплаўных птушак.

Насельніцтва. Асн.— каракалпакі, жывуць узбекі, казахі, рускія, украінцы, татары, туркмены і інш. Сярэдняя шчыльн. 4,4 чал. на 1 *км*². Найб. густа заселена даліна Амудар'і. Гарадскога нас. 36%. Найб. гарады: Нукус, Хаджэйлі, Кунград, Чымбай, Турткуль, Біруні.

Гістарычны нарыс. Этнагенез каракалпакаў звязаны з «чорнымі клабукамі», якія ў 11—12 ст. качавалі на тэр. Пд Украіны і ўдзельнічалі ў паліт. жыцці Кіеўскай Русі. Фарміраванне каракалпакскай народнасці закончылася ў 16 ст. Каракалпакі жылі ў бас. ніжняга цячэння Сырдар'і і ў вярхоўях р. Яік (Урал) і Эмбы. Іх асн. занятак — качавая жывёлагадоўля, земляробства, рыбалоўства. Пераважалі патрыярхальна-феад. адносіны. У 17 — сярэдзіне 18 ст. каракалпакі, што жылі на Сырдар'і, залежалі ад каз. ханаў. Пасля захопу гэтага раёна джунгарамі (1723) каракалпакі рассяляліся па Сярэдняй Азіі. У пач. 19 ст. *Хівінскае ханства* заваявала большасць К., яе насельніцтва перасяліла ў дэльту Амудар'і і аблажыла цяжкімі падаткамі. У 1827—28, 1855—56, 1858—59 каракалпакі паўставалі супраць прыгнятальнікаў. У 1873 правабярэжжа Амудар'і далучана да Расіі і створаны Амудар'інскі аддзел, Хівінскае ханства трапіла пад пратэктарат Расіі. Больш прагрэс. эканоміка Расіі садзейнічала распаду патрыярхальна-феад. асноў, зараджэнню капіталіст. адносін. Узніклі прамысл. прадпрыемствы, павялічылася вытворчасць таварнай бавоўны. Пад уплывам рэвалюц. барацьбы рас. пралетарыяту развіваўся рэвалюц. рух. Прапаганд. і асветную работу ў Хіве вялі паліт. ссыльныя рабочыя. Каракалпакі ўдзельнічалі ў Сярэднеазіяцкім паўстанні 1916.

Сав. ўлада на правабярэжжы Амудар'і ўстаноўлена ў снеж. 1917, і гэтая тэр. ўвайшла ў Туркестанскую АССР (створана ў крас.— маі 1918). Каракалпакі, якія жылі на левым беразе Амудар'і, увайшлі ў Харэзмскую Нар. Сав. рэсп., створаную ў 1920 на тэр. б. Хівінскага ханства. 25.6.1921 на 1-й абл. парт. канфер. аформілася Амудар'інская абл. парт. арг-цыя. 16.2.1925 створана Каракалпакская аўт. вобласць у складзе Каз. АССР, з 1930 — у РСФСР, 20.3.1932 перайтварана ў К. АССР у складзе РСФСР, з 1936 у складзе Узб. ССР. За гады Сав. улады К. ператварылася ў індустр.-аграрную рэспубліку. Развіваюцца прамысл. (рыбаконсервавы камбінат у Муйнаку). Швейная прамысл. і вытв. буд. матэрыялаў. У Нукусе палігр. і юрталямцавы камбінаты, рамонтна-механічны з-д, у Хаджэйлі суднарамонтны, у Тахіяташы рамонтна-механічны з-ды. С. гасп. спецыялізуецца на вырошчванні бавоўніку, рысу, на шаўкаводстве і жывёлагадоўлі. На пач. 1971 у К. 37 калгасаў і 56 саўгасаў. Земляробства паліўное. Пасяўная пл. (тыс. *га*, 1970) 193, у т. л. пад бавоўнікам 120, збожжавымі 24,2 (у т. л. пад рысам 20,9), кармавымі 42,2. Сеюць люцэрну. Жывёлагадоўля каракулеводчага кірунку. На пач. 1971 было (тыс. галоў): авечак і коз 470,4, буйн. раг. жывёлы 263,8 (у т. л. кароў 104,8), свіней 4,5. Гадуюць вярблюдаў. У дэльце Амудар'і андатравы промысел. Чыгунка Чарджоў — Кунград — Бейнеў. Аўтамаб. дарог 3243 *км*, у т. л. з цвёрдым пакрыццём 1007 *км* (1970). Па Амудар'і і Аральскім м. суднаходства. Газаправоды Бухара — Урал і Сярэдняя Азія — Цэнтр.



Нукус. Вуліца Карла Маркса.

наачышчальная і харч. прамысловасць. Бавоўнаачышчальныя з-ды ў Біруні, Кунградзе, Мангіце, Хаджэйлі, Чымбаі, Халкабадзе, Турткуле, Тахтакупыры. У 1970 выпрацавана



738 млн. *квт·гадз* электраэнергіі. Найб. Тахіяташская ДРЭС. Харч. прамысловасць: алейныя з-ды ў Біруні, Хаджэйлі, Чымбаі; мясакамбінаты ў Хаджэйлі, Нукусе. Агародніна-кансервавыя, вінаробныя, кандытарскія, макаронныя прадпрыемствы. Рыбная прамысл. (рыбаконсервавы камбінат у Муйнаку). Швейная прамысл. і вытв. буд. матэрыялаў. У Нукусе палігр. і юрталямцавы камбінаты, рамонтна-механічны з-д, у Хаджэйлі суднарамонтны, у Тахіяташы рамонтна-механічны з-ды. С. гасп. спецыялізуецца на вырошчванні бавоўніку, рысу, на шаўкаводстве і жывёлагадоўлі. На пач. 1971 у К. 37 калгасаў і 56 саўгасаў. Земляробства паліўное. Пасяўная пл. (тыс. *га*, 1970) 193, у т. л. пад бавоўнікам 120, збожжавымі 24,2 (у т. л. пад рысам 20,9), кармавымі 42,2. Сеюць люцэрну. Жывёлагадоўля каракулеводчага кірунку. На пач. 1971 было (тыс. галоў): авечак і коз 470,4, буйн. раг. жывёлы 263,8 (у т. л. кароў 104,8), свіней 4,5. Гадуюць вярблюдаў. У дэльце Амудар'і андатравы промысел. Чыгунка Чарджоў — Кунград — Бейнеў. Аўтамаб. дарог 3243 *км*, у т. л. з цвёрдым пакрыццём 1007 *км* (1970). Па Амудар'і і Аральскім м. суднаходства. Газаправоды Бухара — Урал і Сярэдняя Азія — Цэнтр.

Ахова здароўя. У 1913 на тэр. Каракалп. АССР было 2 бальніцы на 21 ложак, 2 урачы. У 1940 працавала 17 бальніц на 1427 ложкаў, 117 урачоў, 669 чал. сярэдняга мед. персаналу. На пач. 1971 было 102 бальнічныя ўстановы на 7590 ложкаў (106 на 10 тыс. ж.), 116 амбулаторый і паліклінік, 26 дыспансераў, 1083 урачы (15 на 10 тыс. ж.), 4467 чал. сярэдняга мед. персаналу (62 на 10 тыс. ж.), 6 санаторыяў і дамоў адпачынку на 780 ложкаў.

Культура. Да Кастр. рэв. каракалпакі не мелі сваёй пісьменнасці, 99,4% насельніцтва было непісьменнае (1913). У школах навучалася ўсяго 200 дзяцей; сярэдніх спец. і вышэйшых навуч. устаноў не было. За гады Сав. улады створана пісьменнасць, ажыццёўлена ўсеагульнае навучанне на роднай мове. У 1970/71 навуч. г. працавала 711 агульнаадук. школ усіх тыпаў (189,1 тыс. вучняў), 14 сярэдніх спец. навуч. устаноў (8,9 тыс. чал.); Каракалпакскі пед. ін-т. У рэспубліцы 2 музеі, 374 б-кі, 229 клубных устаноў, 287 кінаўстановак (1969), тэлецэнтр, радыёстанцыя. Н.-д. работу вядуць 6 н.-д. устаноў. У 1969 выпускалася 235 газет (у т. л. 12 рэсп.), 2 часопісы. У 1970 выдадзена 164 назвы кніг і брашур.

У вуснай нар. творчасці каракалпакаў вядомы гераічныя эпасы «Каблан», «Алпамыш», «Сорак дзяўчат» і інш. Найбольш значны паэт 18 ст. Джыен-жрау. Паэты 19 ст. Бердах, Куи-Хаджа, Ажыніяз рэалістычна паказвалі падняволенае жыццё народа, заклікалі да барацьбы за свабоду. Пачынальнікі сав. л-ры А. Мусаеў, С. Маджытаў, А. Дабылаў, С. Нурумбетаў. У канцы 20-х і ў 30-я г. ўзніклі драматургія і маст. проза: апавяданні Маджытава і Н. Даўкараева, аповесці М. Дарыбаева, А. Шамуратава, п'есы А. Утэпава. У 50-я і 60-я г. напісаны раманы і аповесці «Рыбакова дачка» А. Бегімава, «На берагах Амудар'і» Дж. Аймурзаева, «Ночы без сну» К. Каіпбергенава, «Дачка каракалпака» К. Султанава, «Айдана» У. Хаджанізава, вершы і паэмы В. Каіпназарава, І. Юсупава, Х. Турумбетава, Т. Жумамуратава, драматызаваныя творы С. Хаджанізава, Дж. Аймурзаева і інш. На каракалп. мове выдадзены зб. апавяд. Я. Коласа «Як птушкі дуб ратавалі» (1964), паэма П. Броўкі «Заўсёды з Леніным» (1966). На бел. мову перакл. паасобныя творы Д. Айтмурата, К. Рахманава, І. Юсупава і інш.

На тэр. К. захаваліся шматлікія помнікі арх. і мастацтва стараж. і сярэдневяковага Харэзма (рэшты замкаў, крэпасцей, ірыгац. збудаванняў, кераміка, тэракотавыя статуэткі, рэшткі манум. роспісаў). Традыц. жыллё каракалпакаў-паўкачэўнікаў — юрта і глінабітны дом або мазанка з чароту з юртаю пры іх. Здаўна развіта дэкар.-прыкладное мастацтва: разьба, роспіс, інкрустацыя па дрэве (дзверы юрты, бытавыя прадметы), гравіроўка і чаканка па метале, узорыстае ткацтва (кошмы, вузкія дывановыя арнаментальныя палосы — ак-кур, шырокія з махрамі — жамбау), вышыўка, ціснение па скуры. Арнамент геаметрычны, раслінны і стылізаваныя матывы барановых рагоў. У сав. час выраслі гарады, пасёлкі, сельскія паселішчы з правільнай планіроўкай і грамадска-адм. цэнтрам. Будуюць індустр. метадамі, вял. ўвага аддаецца азеляненню. На нац. аснове развіваецца прафес. мастацтва. У скульптуры працуюць Ж. Кутымуратаў, Д. Турэнілзаў, Ю. Маткарымаў, у жывапісе — Ф. Мадгазін, І. Савіцкі, Р. Матэвасян, К. Саіпаў. Сярод графікаў: А. Курбанбаеў, К. Бердымуратаў і інш.

Нар. музыка К. будуецца на сяміступенных дыятанічных ладах з паўтонам у аснове. Аднагалосым песням уласцівыя багатая мелізматыка, арыгінальная манера гуказдабывання. Развіта нар. інстр. музыка, асабліва для шчыпковага інструмента дутара (двухгалосая). Шырока ўжываюцца баламан, сурнай (духавыя). Носьбіты нар. муз. культуры: казачнікі жрау, якія суправаджаюць апавяданне ігрой на кабузе (смыковы), спевакі бахсы (а сучасных музыкантаў папулярны Жапакбахсы). У сав. час развіваецца прафес. музыка на аснове шматгалосся. Створаны муз. школы, філармонія, Дом нар. творчасці, ансамбль песні і танца, аркестр нар. інструментаў, вывучаецца фальклор.

Элементы т-ра былі ў стараж. нар. абрадах і гульнях, у творчасці нар. акцёраў бахсы і жрау. З 2-й пал. 19 ст. пашырана мастацтва масхарабозаў і лялечнікаў, запазычанае ў харэзмскіх узбекаў. У 1917 узніклі тэатр. самадзейныя гурткі. Адзін з заснавальнікаў нац. т-ра і драматургіі А. Утэпаў. У 1930 на базе трупы «Танг Нуры» створаны Каракалпакскі т-р муз. драмы і камедыі ў Турткулі (з 1939 імя Станіслаўскага, з 1942 у Нукусе). У 1963 пастаўлена бел. п'еса «Лявоніха на арбіце» А. Макаёнка. Сярод тэатр. дзеячаў (1971): нар. арт. СССР А. Шамуратава, нар. артысты Узб. ССР і К. АССР С. Авезава, У. Даўлетава, З. Зарыпаў, Ю. Мамутаў, Р. Сеітаў, Г. Шэразіева.

Літ.: Очерки истории Каракалпакской АССР, т. 1—2, Ташкент, 1964; Шалекенов У. Х. К вопросу о формировании каракалпакской социалистической нации, Нукус, 1958; Досумов Я. М. Победа Великой Октябрьской социалистической революции в Каракалпакии, Ташкент, 1958; Узбекистан, М., 1967 (Советский Союз); Экономическое преобразование Каракалпакии за годы Советской власти, Нукус, 1969; Давкараев Н. Очерки по истории дореволюционной каракалпакской литературы, Ташкент, 1959; Нурмухамедов М. К. Краткий очерк истории каракалпакской советской литературы, Ташкент, 1959; Ягодж. Каракалпакская советская проза, Ташкент, 1968; Жданко Т. А. Народное орнаментальное искусство каракалпаков, у кн.: Труды Хорезмской археолого-этнографической экспедиции, т. 3, М., 1958; Савицкий И. В. Народное прикладное искусство каракалпаков.

Ювелірнае ўпрыгожанне. Серабро, каляровыя камяні (злева). Тканы дыван.





Резьба по дереву, Ташкент, 1965; Аллаяазаров Т. Каракалпакский советский театр, Ташкент, 1966; История советского драматического театра, т. 4—5, М., 1968—69.

Л. У. Утзеў (прырода, нар. гасп.). Ташкент; *І. Касымбетаў, К. Аметаў* (гістар. нарыс). Нукус.

КАРАКАРУМ, горная сістэма ў Індыі і Кітаі, паміж Куньлунем і Гімалаямі. Другая па вышыні на Зямлі пасля Гімалаяў. Водападзел рэк Інда і Тарыма. Найвыш. пункт г. Чагары (8611 *м*). Каля 16 вяршынь перавышаюць 8 тыс. *м*.

Рэльеф зах. ч. моцна парэзаны (альпійскі); усходняй — больш мяккі, пакаты. У геал. будове вылучаецца 3 палосы: паўд. з гнейсаў, гранітаў, сярэдняя з асадкавых і метамарфічных парод палеазойскага і мезазойскага ўзросту, паўн. з крышталічных сланцаў і юрскіх вапнякоў. Снегавая лінія на паўн. схіле на выш. 5900 *м*, на паўд. каля 4700 *м*. Вялікія ледавікі. Расліннае покрыва беднае, асабліва на паўн. схілах. На паўд. схілах да выш. 3500 *м* лясы з асіны, бярозы, кедра; вышэй хмызняковыя зараснікі, субальпійскія лугі. Перавалы на выш. 4600—5000 *м* на З і вышэй 5500 *м* на У. Насельніцтва (тыбетцы, прыпамірскія таджыкі і індыйцы) займаецца пераважна земляробствам (абожжавыя культуры) і садоўніцтвам.

КАРАКАС (Caracas), сталіца Венесуэлы. Размешчана ў горнай даліне Берагавых Андаў, за 13 *км* ад Карыбскага м., на выш. 950 *м* над узр. м., на Панамерыканскай шашы. Засн. ў 1567 на месцы сялібы індзейскага племя каракас. Чыг. станцыя, аэрапорт (міжнар.). 787 тыс. ж. (1969). Прадпрыемствы харч., тэкст., гарбарна-абутковай, гумавай, хім.-фармацэўтычнай, папяровай, нафтаперапр. і цэментавай прамысловасці. Ун-т, Нац. тэатр.

КАРАКСКАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКРУГА, у складзе Камчацкай вобл. РСФСР. Утворана 10.12.1930. Займае Пн п-ва Камчатка, прылеглую частку мацерыка і в-аў Карагінскі; абмываецца Ахоцкім і Берынгавым морамі. Пл. 301,5 тыс. км². Нас. 31 тыс. чал. (1971). Падзяляецца на 4 раёны; 5 гар. пасёлкаў. Цэнтр г. п. Палана. Карту гл. да арт. *Камчацкая вобласць*.

Рэльеф сярэднегорны. На мацерыковай ч. Каракскае нагор'е (выш. да 2562 *м*, г. Ледзяная), Пенжынскі хр., Ічыгемскі хр. і Калымскае нагор'е; на паўночным захадзе Сярэдзінны хр. Нізіны Пенжынская, Парапольскі дол і нізіна ўздоўж узбярэжжа Ахоцкага м. Карысныя выкапні: буры вугаль, торф, сера, ртуць, буд. м. Клімат субарктычны. Сярэдняя т-ра студз. каля −30, ліп. 10 °С. Ападкаў 300—550 *мм* за год. Вегет. перыяд 65—110 дзён. Гал. рэкі Пенжына і Тыгіль. Пераважаюць горна-тундравыя, а на нізінах тундравыя глебы. Расліннасць тундравая, у вярхоўях Пенжыны лістоўніца, на зах. узбярэжжы каменная бяроза. Насяляюць акругу рускія, з карэнных жыхароў каракі, ітэльмены, эвенкі, чукчы. Сярэдняя шчыльн. 1 чал. на 10 км². Гарадскога нас. 35%. Гар. пасёлкі Палана, Ільпырскі, Корф, Асора, Пахачы.

Прамысловасць рыбная (усх. ўзбярэжжа), крабавая (зах. ўзбярэжжа) і вуглездабыўная (Корфскае радовішча). С. гасп. спецыялізуецца на аленегадоўлі. На 1.1.1971 (тыс. галоў) аленяў 144,8, буйн. раг. жывёлы 2,1 (у т. л. кароў 1,1), свіней 0,8. Разводзяць ездавых сабак, коней. Пасяўная пл. 119 *га* (1971). Сеюць кармавыя культуры, бульбу, агародніну. Промыслы пушны (собаль, ліс, гарнастай), марскі і зверабойны. Транспарт марскі і паветраны, зімою перавозкі на аленях і сабаках. Краязнаўчы музей (Палана). Акруговая газ. «Корякский коммунист».

Літ.: Гл. пры арт. *Камчацкая вобласць*.

В. П. Бараўзіна.

КАРАКУЛЬ (каракульскія смушкі), шкуркі, знятыя з ягнят пароды *каракульская* на другі — трэці дзень пасля нараджэння.

Каштоўнае футра, мае пругкую, шаўкавістую, бліскучую шэрсць з завіткамі розных формы (вальчорныя (больш як 80%), шэрыя (12—15%), каляровых мала. Са шкурак неданошаных каракульскіх ягнят (узрост плода каля 129—135 дзён) атрымліваюць каракульчу.

Літ.: Канцепольский А. С. Альбом каракуля и смушки, М., 1962; Кузнецов Б. А. Каракуль и смушка, М., 1955.

КАРАКУЛЬСКАЯ пародa авечак, парода грубашэрсных тлустахвостых авечак смушкава-малочнага кірунку. Гадуюць у Іране, Афганістане, Паўд.-Зах. Афрыцы, у некат. еўрап. і амер. краінах; у СССР — у Сярэдняй Азіі, Казахстане, на Украіне, у Малдавіі, паўд. абласцях РСФСР. Асн. прадукцыя — *каракуль*. Племянная работа накіравана на тое, каб палепшыць якасць і павялічыць асартымент каракуля.



Каля 80—90% пагалоўя авечак — чорныя, якія з узростам сівеюць. Жывая маса бараноў 55—80, авечак 45—60 *кг*. Стрыгуць авечак два разы на год: баран дае 2—4, авечка — 2,5—3 *кг* воўны. За перыяд лактацыі ад авечак, што асталіся без ягнят, атрымліваюць 20—50 *кг* малака тлустасцю 7—8%.

Літ.: Николаев А. П. Овцеводство, 3 изд., М., 1964.

КАРАКУМСКІ КАНАЛ імя У. І. Леніна, гідратэхнічнае збудаванне на Пд Турк. ССР для арашэння прылеглых частак *Каракумаў*, суднаходства, водазабеспячэння населеных пунктаў.

Пачынаецца ад р. Амудар'і каля с. Басага і канчаецца на п-ве Чэлекен. Запраектаваная даўж. 1400 км. Буд-ва пачата ў 1954. 1-я чарга канала, Амудар'я — Мургаб, даўж. 400 км здадзена ў эксплуатацыю ў 1962; 2-я чарга, Мургаб — Таджэн, даўж. 138 км — у 1966; 3-я чарга, Таджэн — Геок-Тэпэ, даўж. 302 км; 4-я чарга, даўж. 341 км закончыцца каля Балханскага вадасх. У 1971 яго даўж. 845 км, арашоная пл. 309 тыс. *га* зямлі. На трасе канала створаны вадасховішчы Мургабскае, Хаўханскае, Тэджэнскае і інш.; будуецца Капетдагскае вадасховішча. З пабудовай канала значна павялічыцца плошча пад тонкавалакністы бавоўнік, сады, вінаграднікі, будзе створана магутная база развіцця жывёлагадоўлі.

КАРАКУМЫ (цюрк. кара — чорны, кум — пясок), найбольшая пустыня ў СССР. Размешчана пераважна на тэр. Туркм. ССР, паміж перадгор'ямі Капетдага, Карабіля і Бадхыза на Пд, Сарыкамышскай катлавінай на Пн, ракой Амудар'ёй на У, рэчышчам Зах. Узбоя на З. Пл. больш за 350 тыс. км². Тэктанічная ўпадзіна, запоўненая пясчанымі адкладамі стараж. Амудар'і, Мургаба, Таджэна. Паверхня — дробнаўзгорыстая раўніна, нахіленая з У на З. Мерыдыянальна выцягнуты пясчаныя грады і ўзгорыстыя пяскі (Заунгузскія і Цэнтр. Каракумы); на Пд гліністы ўчасткі (такыры). Каля 5% тэр. занята барханнымі пяскамі, амаль без расліннасці. Карысныя выкапні: сера, газ, нафта.

Клімат рэзка кантынентальны, сухі. Сярэдняя т-ра студз. −5 на Пн, −3 на Пд; ліп. 28 на Пн, 32 °С на Пд. Ападкаў 75—130 *мм* за год, максімум — вясной, лета сухое. Уздоўж Амудар'і, Мургаба, Таджэна, арашальнага Каракумскага канала развіта земляробства. К. адносна багатыя грунтавымі водамі. Вясной (канец крас. — пач. мая) усе тэр., выключаючы барханныя пяскі, укрыта эфемерамі і эфемероідамі. Пашыраны пясчаная асака (ілек), хмызняковыя зараснікі белага і чорнага саксаула. Жывёльны свет: пясчаная рысь — каракал, джэйран, ліс, дзікабраз, заяц, грызуны, стэпавая чарапаха, яшчаркі — агама, геконы, варан, змеі; птушкі — саксаульная сойка, пустынны груган, вераб'і; павукападобныя — фалангі, скарпіёны. Створаны Рэпятэкскі запаведнік (пл. 346 км²).

Літ.: Очерки природы Кара-Кумов, М., 1955; Туркменская ССР, М., 1969 (Советский Союз).

М. К. Чартко. Мінск.

КАРАЛАВАЕ МОРА (Coral Sea), паўзамкнёнае мора Ціхага ак., паміж паўн.-ўсх. узбярэжжам Аўстраліі і а-вамі Новыя Гебрыды. На ПнЗ Торэсавым пралівам злучаецца з Індыйскім ак. Пл. 4791 тыс. км². Глыб. да 9165 *м*. Шмат каралавых рыфаў і астравоў. Т-ра вады на паверхні ад 19 (жн.) да 24 (лютым) на Пд, да 28 °С на Пн. Салёнасць 34,5—35,5‰. Гал. порты: Кэрнс (Аўстралія), Порт-Морсбі (Новая Гвінея), Нумеа (Новая Каледонія).

КАРАЛАВЫЯ ПАЛІПЫ, клас беспазваночных жывёл. Гл. *Каралы*.

КАРАЛЁВІЧЫ, вёска ў Галубіцкім с/с Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Расія». За 17 *км* на У ад Глыбокага, 217 *км* ад Віцебска, 10 *км* ад чыг. ст. Падсвілле. 232 ж., двароў 85 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі, магазін. У 1944 вёску часткова спалілі нямец.-фаш. захопнікі.

КАРАЛЁНКА Дамітрый Цімафеевіч (25.9.1912, с. Белаводск Старабельскага пав. Харкаўскай губ. — 22.4.1944), адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Віцебскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1939. У 1927—35 шахцёр. З 1935 у Чырв. Арміі — камандзір батарэі, нач. артылерыі палка. У партызанах з сак. 1942 — нач. штаба, камандзір атрада Чашніцкай брыгады («Дубава»); з снеж. 1943 камандзір *партызанскай брыгады Лепельскай* Віцебскай вобл. Загінуў у баі. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Айч. Вайны 1-й ступені, медалём.

КАРАЛЁНКА Уладзімір Галакціёнавіч [15 (27).7.1853, Жытомір — 25.12.1921], рускі пісьменнік. З сям'і юрыста. Вучыўся ў Тэхналагічным (1871—73) і Горным (1877—78) ін-тах у Пецярбургу і ў Пятроўскай земляробчай і лясной акадэміі (1874—76) у Маскве. У 1876—77 у ссылцы ў Кранштаце, з 1879 у ссылцы ў Вяцкай губ. і Якуціі па падазрэнні ў рэвалюц. дзейнасці. З 1885 у Ніжнім Ноўгарадзе, з 1896 у Пецярбургу. Чл. рэдак-



цыі, адзін з кіраўнікоў нарадавольніцкага час. «Русское богатство» (з 1894, з 1904 рэдактар-выдавец). З 1900 у Палтаве. Светапогляд К. фарміраваўся пад уплывам рус. рэвалюц. дэмакратаў. Друкавацца пачаў у 1878. Асн. тэматыка творчасці — мужнасць і непахіснасць рэвалюцыянераў («Дзіўная», 1880, апубл. ў Расіі 1905), абуджэнне рэвалюц. пратэсту («Яшка», 1881; «Сон Макара», 1885; «Забойца», 1885; «Рака гуляе», 1892; «Агеньчыкі», 1901; і інш.), крытыка самадзяржаўя («Ат-Даван», 1892; «Гасударавы ямшчыкі», 1901; «Феадалы», 1904; і інш.). У аповесці «Сляпы музыка» (1886) паказаны герой, які бачыць шчасце ў служэнні народу. Герой аповесці «Без языка» (1895) выступае супраць бяздушнасці амер. дэмакратыі. Мемуары «Гісторыя майго сучасніка» (кн. 1—4, 1906—22) — твор пра ідэйнае станаўленне і рэвалюц. барацьбу інтэлігенцыі 60—80-х г. Публіцыстыка К. («У галодны год», 1893; «Мултанскае ахвярапрынашэнне», 1895—96; «Дом № 13», 1903, апубл. ў Расіі 1905; «Гомельская судовая драма», 1905; «Сарачынская трагедыя», 1907; «Бытавая з'ява», 1910; і інш.) — узор барацьбы супраць прымусу і гвалту самадзяржаўя. Аўтар арт. пра В. Бялінскага, М. Салтыкова-Шчадрына, Л. Талстога, Г. Успенскага, М. Чарнышэўскага, А. Чэхава і інш. Рэаліст. творчасці К. ўласцівы рысы гераічнага рамантызму, паэтызацыя духоўнага багацця народа, спалучэнне эпічнасці з лірызмам, псіхал. тонкасць вобразаў. Аповесць К. «Лес шуміць» інсцэніравана БДТ-1 (т-р імя Я. Купалы, 1922). На бел. мову творы К. пераклі А. Александровіч, С. Дарожны, К. Чорны, Я. Шарахоўскі.

Тв.: Полн. собр. соч., т. 1—5, 7—8, 13, 15—22, 24, 50—51 (выд. пасмяротнае, не закончана), Харьков — Полтава, 1922—29; Собр. соч., т. 1—10, М., 1953—56; Собр. соч. в 6-ти т., т. 1—6, М., 1971; бел. пер. — Судны дзень, Вільня, [б. г.]; Лес шуміць, Мн., 1920; У благой кампаніі, Мн., 1930; На заводзе, Мн., 1931; Сон Макара. — Ат-Даван. — У воблачны дзень, Мн., 1931; Апавяданні, Мн., 1937; Без языка, Мн., 1939; Дзеці падзямелля, Мн., 1939; Куплены хлопчык, Мн., 1947; Сляпы музыка, Мн., 1950.

Літ.: Короленко С. В. Десять лет в провинции, Ижевск, 1966; *яе ж.* Книга об отце, Ижевск, 1968; Дерман А. Жизнь В. Г. Короленко, М. — Л., 1946; Балабанович Е., В. Г. Короленко, М., 1947; Бялый Г. А., В. Г. Короленко, М. — Л., 1949; Миронов Г. Короленко, М., 1962; В. Г. Короленко в воспоминаниях современников, М., 1962.

В. С. Семенякоў. Мінск.

КАРАЛЕЎСКАЯ СЛАБАДА, прыстань на Бярэзіне, вёска ў Краснаўскім с/с Светлагорскага р-на Гомельскай вобл. За 53 *км* на ПнЗ ад Светлагорска, 163 *км* ад Гомеля, 23 *км* ад чыг. ст. Бярэзіна, каля аўтамаб. дарогі Бабруйск — Калінкавічы (2,3 *км*). 406 ж., двароў 134 (1971). 8-гадовая школа, клуб, магазін.

КАРАЛЕЎСТВА, феадальная або буржуазная дзяржава з манархічнай формай праўлення, узначальваецца каралём. Большасць сучасных К. — канстытуцыйныя манархіі (Вялікабрытанія, Данія і інш.). Гл. *Манархія*.

КАРАЛЕЎСТВА ПОЛЬСКАЕ (Царства Польскае), назва часткі Польшчы, якая паводле *Венскага кангрэсу 1814—15*

адышла да Расійскай імперыі. Падзялялася на 8 ваяводстваў, мела насельніцтва 9,5 млн. чал. (паводле перапісу 1897). Паводле канстытуцыі К. П. з ліст. 1815 канстытуцыйная манархія, звязаная рэальнай уніяй з Расіяй. Пасля паўстання 1830—31 аўтаномія К. П. скасавана, ваяводствы пераўтворана ў губерні (1837). Пасля паўстання 1863—64 уніфікацыя з імперыяй паскорылася — ажыццёўлены рэформы адм. будовы, асветы, суда. З 1888 К. П. афіц. называлася Прывіслінскі край.

Літ.: История Польши, т. 1—2, М., 1954—55.

КАРАЛЕЎСТВА СЕРБАЎ, ХАРВАТАЎ І СЛАВЕНЦАЎ (Каралеўства СХС), афіц. назва дзяржавы, якая ўзнікла 1.12.1918 пасля паражэння ў 1-й сусв. вайне Аўстра-Венгрыі і ў выніку аб'яднання яе паўднёваславянскіх земляў — Славеніі, Харватыі, Славоніі, Босніі і Герцагавіны, Далмацыі, Ваяводзіны — з каралеўствамі Сербіяй і Чарнагорыяй. З 1929 — *Югаславія*.

КАРАЛЁЎ Аляксей Сямёнавіч (н. 27.1.1922, в. Новыя Сліжы Горацкага пав. Гомельскай губ.), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1953. Удзельнік Айч. вайны. У 1946—51 калгаснік калгаса «Новы шлях», у 1952—68 механізатар Любінцкай МТС, саўгаса «Гарадзішча», з 1968 трактарыст-машыніст шырокага профілю саўгаса «Юбілейны» Шклоўскага р-на Магілёўскай вобл. Дэп. Вярх. Савета БССР 5-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, медалямі.

КАРАЛЁЎ Віктар Палікарпавіч [н. 5(18).4. 1912, хутар Фралова Усць-Мядзведзіцкай акр. Вобл. Войска Данскога], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Мінскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1940. З 1934 на сав. і камсамольскай рабоце ў Фралоўскім р-не. З ліп. 1941 на фронце, з мая 1942 у партызанах — радавы, камандзір узвода, камісар атрада; з 25.11.1942 камісар *партызанскай брыгады «За Савецкую Беларусь»*, з 20.7.1943 *партызанскай брыгады «Чырвоны сцяг»* Мінскай вобл. Пасля вайны на парт., сав., гасп. рабоце. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі. Жыве ў г. Фралове.

КАРАЛЁЎ Мікалай Піліпавіч [18.6(1.7). 1906, в. Амінавічы Бабруйскага пав. Мінскай губ.— 9.4.1972], удзельнік партыз. руху ў Магілёўскай вобл. ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944), ген.-м. (1943). З сялян. Чл. КПСС з 1939. Скончыў Вышэйшую парт. школу пры ЦК КПСС (1956). У 1930—37 рабочы Дуброўенскага з-да «1 Мая», старшыня калгаса (25-тысячнік), старшыня сельсавета. З 1937 нам. старшыні, старшыня Асіповіцкага райвыканкома. У партызанах з 3.7.1941— камандзір групы, атрада, *партызанскай брыгады Асіповіцкай* у Магілёўскай вобл. З жн. 1944 старшыня Магілёўскага гарвыканкома. У 1953—



69 на парт. і сав. рабоце. Дэп. Вярх. Савета БССР 2—4-га скл. Чл. Прэзідыума Вярх. Савета БССР. Ганаровы грамадзянін Магілёва.

КАРАЛЁЎ Павел Міхайлавіч [н. 16(29).7. 1915, в. Крыцкае Віцебскага пав.], Герой Сав. Саюза (1945). З сялян. Чл. КПСС з 1943. У Чырв. Арміі з 1936. У Айч. вайну на Зах., Бранскім, 1-м Укр. франтах. Вызначыўся ў баях у Германіі на рубяжы Одэра. З 27.1 да 4.2.1945 батарэя пад камандаваннем К. на ўчастку Ліндэн — Олаў адбіла 11 контратак пяхоты і танкаў ворага. Жыве ў Вінніцы.



КАРАЛЁЎ Сяргей Паўлавіч [30.12.1906(12. 1.1907), Жытомір — 14.1.1966], савецкі вучоны ў галіне ракетна-касмічнай тэхнікі. Акад. АН СССР (1958, чл.-кар. 1953). Двойчы Герой Сац. Працы (1956, 1961). Чл. КПСС з 1953. Скончыў Маск. вышэйшае тэхн. вуч. імя Баўмана (1930) і адначасова Маск. школу лётчыкаў. З 1927 працаваў у авіяц. прамысловасці. Адзін з арганізатараў, потым начальнік (з 1932) Групы вывучэння рэактыўнага руху, дзе ствараліся першыя сав. вадкасныя ракеты і праводзіліся іх выпрабаванні. З 1933 нам. дырэктара Рэактыўнага НДІ, з 1934 кіраўнік аддзела ракетных лятальных апаратаў. У 1942—46 нам. гал. канструктара па рэактыўных установах для баявых самалётаў. К.— канструктар першых сав. шматступеньчатых балістычных ракет і ракетна-касм. сістэм, з дапамогай якіх запушчаны першы ў свеце штучны спадарожнік Зямлі (4.10.1957), аўтам. міжпланетныя станцыі «Месяц», «Венера», «Марс», «Зонд». Пад кіраўніцтвам К. распрацаваны і запушчаны арбітальныя касм. караблі «Усход» і «Узыход», ажыццёўлены першы ў свеце палёт у космас Ю. А. Гагарына (12.4.1961), выхад у адкрыты космас лётчыка-касманаўта СССР А. А. Лявонава (18.3.1965), вывад на арбіты сістэмы звышдалёкай сувязі спадарожнікаў «Маланка-1», спадарожнікаў Зямлі серыі «Электрон» і «Космас». Імем К. названа буйное ўтварэнне (таласаід) на адваротным баку Месяца. Ленінская прэмія 1957. Узнаг. 3 ордэнамі Леніна, ордэнам «Знак Пашаны», медалямі.

Тв.: Ракетный полет в стратосфере, М., 1934.
Літ.: Асташенков П. Т. Академик С. П. Королев, М., 1969; Романов А. П. Конструктор космических кораблей, 2 изд., М., 1971; Апенченко О. Сергей Королев, М., 1969.

П. Ц. Асташэнкаў, К. І. Труноў. Масква.

КАРАЛЁЎ Юрый Фёдаравіч (н. 8.5.1923, г. Сімбірск), беларускі савецкі вучоны ў галіне дэрмата-венералогіі. Д-р мед. н. (1962), праф. (1967). Член КПСС з 1944. У 1946 скончыў Ленінградскую ваен.-мед. акадэмію імя Кірава і там працаваў (1947—68). З 1969 заг. кафедры скурных і венерычных хвароб Бел. ін-та ўдасканалення ўрачоў. Асн. працы па антыбіётыкатэрапіі скурных і венерычных хвароб. Узнаг. ордэнам Чырв. Зоркі, медалямі.

Тв.: Себорея, Л., 1963; Холинергические процессы при некоторых дерматозах, «Вестник дерматологии и венерологии», 1967, № 9.

КАРАЛЁЎ СТАН, вёска ў Калодзішчанскім с/с Мінскага р-на. Цэнтр саўгаса «Гарадзішча». За 14 *км* на ПнУ ад Мінска, 9 *км* ад чыг. ст. Калодзішчы, на аўтамагістралі Брэст — Масква. 650 ж., гасп. 195 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, магазін. 2.7. 1944 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі. Помнік на брацкай магіле 90 сав. воінаў і партызан Айч. вайны.

КАРАЛІ, тое, што *пацеркі*.

КАРАЛІН, вёска ў Зэльвенскім р-не Гродзенскай вобл., на р. Зальвянка. Цэнтр сельсавета і калгаса «Каралін». За 9 *км* на ПдУ ад Зэльвы, 121 *км* ад Гродна, на аўтамаб. дарозе, якая злучае вёску з Зэльвай. 323 ж., гасп. 103 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа. Дом культуры, фельч.-ак. пункт, вет. пункт, аддз. сувязі, магазін. У 1941 ням.-фаш. захопнікі спалілі вёску. Помнік 58 сав. воінам і землякам, якія загінулі ў Айч. вайну.

КАРАЛІН, вёска ў Вярховіцкім с/с Камянецкага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр калгаса «Расія». За 22 *км* на З ад Камянца, 50 *км* ад Брэста, 6 *км* ад чыг. ст. Высока-Літоўск, на аўтамаб. дарозе Высокае — в. Вярховічы. 311 ж., двароў 71 (1971). Пач. школа, клуб, фельч.-ак. пункт, вет. пункт, аддз. сувязі, сталовая, магазін.

КАРАЛІНСКІЯ, МАРШАЛАВЫ І МАРЫЯНСКІЯ АСТРАВЫ (Caroline, Marshall and Marianas Islands), падапечная тэр. ААН (акрамя в-ва *Гуам*) на З Ціхага ак.; пад кіраваннем ЗША. Пл. 1,8 тыс. км², нас. 98 тыс. чал. (1969), пераважна мікранезійцы. Адм. ц. Сайпан.

А-вы вулканічныя (Марыянскія, зах. ч. Каралінскіх) і каралавыя. Клімат экватарыяльны і субэкватарыяльны. Расліннасць трапічная, на каралавых а-вах абеднена. Земляробства (вырошчванне какосавай пальмы, цукр. трыснягу, батату, маніёку, хлебнага дрэва, ананасаў, агародніны). Рыбалоўства. Шматлікія ваен. базы ЗША, праводзіліся выпрабаванні ядз. зброі (а-вы Бікіні, Эніветак з групы Маршалавых). Насельніцтва вядзе барацьбу супраць выкарыстання ўладамі ЗША на ваен. мэты.

Літ.: Океания (Справочник), М., 1971; Говоров К. А. Океания, М., 1971.

КАРАЛЫ, каралавыя паліпы (Anthozoa), клас беспазваночных жывёл тыпу *кішачнаполасцевых*. Каля 6100 відаў. Выключна марскія арганізмы.

Цела К. радыяльна-сіметрычнае, даўж. ад некалькіх *мм* да 1 *м* (актыній). У залежнасці ад колькасці перагародак гастральнай поласці падзяляюцца на падкласы васьмі- і шасціпрамяневых. Большасць жыве калоніямі, прымацаванымі да грунту, і мае вапнавы шкілет, дзякуючы якому ўтварае каралавыя рыфы і а-вы ў трапічных морах. Многія адзіночныя К. рухаюцца па паверхні і закопваюцца ў грунт. Скопішчы вапнавых шкілетаў К. выкарыстоўваюцца ў буд-ве, для пакрыцця дарог, вырабу вапны і як запаўняльнікі водаправодных фільтраў.

КАРАЛЬКІ (Regulidae), сямейства птушак атр. *вераб'іных*. 6 відаў. Пашыраны ў хвойных (пераважна ў яловых) лясах Еўропы, Азіі і Паўн. Амерыкі. У СССР 3 віды, на Беларусі 2: жоўтагаловы К. (R. regulus) і чырвонагаловы К. (R. ignicapillus).



Жоўтагаловы каралёк.

Даўж. 9—11 *см*, маса 5—7 *г*. Апярэнне мяккае, пушыстае. Жоўтагаловы К.— самая маленькая з птушак Беларусі (маса 5,5—6,6 *г*). Апярэнне на спіне шаравата-зялёнае, брушка светла-шэрае, на крылах па дзве белыя палоскі, на галаве жоўта-ватa-аранжавы чубок. Аселая і вандроўная птушка. Гняздо робіць на дрэвах і ў кустах. Нясе 6—10 яец (2 разы на год). Насіжвае 12—17 дзён. Корміцца пасякомымі і іх лічынкамі. Чырвонагаловы К. адрозніваецца ад жоўтагаловага белымі бровамі, чорнай палоскаю, што ідзе над і пад вокам, аранжава-чырвонаю шапачкаю. Трапляецца на ПдЗ і З Беларусі. Рэдкая птушка.

Р. К. Кажэўнікава. Мінск.

КАРАЛЬКОЎ Іван Васілевіч (н. 5.10.1919, с. Тундрына Сургуцкага пав. Табольскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1945. На фронце з 1943, кулямётчык. Вызначыўся на тэр. Камарынскага р-на Палескай вобл. У час пераправы цераз Дняпро знішчыў варожае кулямётнае гняздо, у баі за плацдарм агнём з кулямёта падтрымліваў наступленне пяхоты. У баі за в. Галкі і Усохі 29.9—3.10.1943 з яго ўдзелам адбіта 10 варожых контратак. Жыве ў Смаленску.

КАРАМЗІН Мікалай Міхайлавіч [1(12).12. 1766, с. Знаменскае Сімбірскай губ.— 21.5(2. 6).1826], рускі пісьменнік, гісторык; вядомы прадстаўнік сентыменталізму ў рус. літаратуры. З дваран. Літ. дзейнасць пачаў перакладамі. Апубл. аповесці «Наталля — баярская дачка» (1792), «Марфа-пасадніца» (1803), «Рыцар нашага часу» (1802—03, незакончаная) і інш. У аповесцях «Востраў Борнхальм» і «Сьера-Марэна» выяўляюцца рысы рамантызму. Найб. вядомыя творы К.— аповесць «Бедная Ліза» (1792) і «Лісты рускага падарожніка» (1791—92, 1794—95). К. шмат зрабіў для станаўлення рус. літ. мовы, наблізіў яе да размоўнай. Аўтар «Гісторыі дзяржавы Расійскай» (т. 1—12, 1816—29), напісанай з дваранска-манарх. пазіцый. У ёй багаты фактычны матэрыял па гісторыі Расіі ад старажытных часоў да 17 ст., ёсць матэрыялы з гісторыі Беларусі. Выдаваў «Мо-



сковский журнал» (1791—92), альманах «Аглая» (1794—95), заснаваў (1802) час. «Вестник Европы».

Тв.: Избр. соч., т. 1—2, М.—Л., 1964; Избр. произв., М., 1966; Полн. собр. стихотворений, 2 изд., М.—Л., 1966.

Літ.: Белинский В. Г. Полн. собр. соч., т. 7, М., 1955, с. 132—142, 509—526; Благой Д. Д. История русской литературы XVIII в., М., 1960; XVIII век, сб. 8, Л., 1969.

КАРАН (араб. кар'ан — чытанне), галоўная свяшчэнная кніга *ісламу*, якую мусульманскае багаслоўе выдае за божае адкравенне.

Паводле мусульм. веравучэння, К. існаваў вечна, арыгінал яго быццам знаходзіцца пад прастолам Алаха. Бурж. ўсходазнаўцы аўтарства К. прыпісваюць *Мухамеду*. Аднак сучасныя даследаванні К. як гістар. крыніцы даюць падставу меркаваць, што К. напісаны рознымі людзьмі ў розны час. Кананізаваны спіс К. складзены ў 7—8 ст. Да таго часу належаць і найбольш стараж. рукапісы, што дайшлі да нас. Напісаны К. на араб. мове рыфмаванаю прозаю, складаецца з 114 сур (раздзелаў), размешчаных у парадку памяншэння колькасці вершаў (аятаў). У агульнапрынятым спісе 6225 аятаў. К. змяшчае закліканні і праклёны, запазычаныя з даісламскіх культаў, вялікія запазычанні з старажытнаіудзейскай і хрысц. міфалогіі (біблейская карціна свету, персанажы ад Адама да Хрыста) і з старажытнараб. фальклору, праноцтвы пра канец свету і страшны суд, прадпісанні, якія ў інтарэсах прыватных уласнікаў рэгулююць маёмасныя і сямейныя адносіны, выхоўваюць у мусульман нянавісць да іншаверных. «Каран і заснаванае на ім мусульманскае заканадаўства зводзяць геаграфію і этнаграфію розных народаў да простай і вручнай формулы падзелу іх на дзве краіны і дзве нацыі: прававерных і няверных. Няверны — гэта «харбі», вораг. Іслам ставіць няверных па-за законам і стварае стан бесперапыннай варожасці паміж мусульманамі і нявернымі» (Маркс К. и Энгельс Ф. Соч., т. 10, с. 167). Мусульм. духавенства ў залежнасці ад канкрэтных мэт адводзіла і супярэчліва тлумачыць К. Спробы сучасных мадэрнізатараў падпавіць К. не мяняюць антынавук. і рэакц. сутнасці яго вучэння. *Ю. М. Манін.* Мінск.

КАРАНЕЎСКАЯ Марыя Сяргееўна (н. 4.12.1926, ст. Прыяміна Барысаўскага р-на Барысаўскай акр.), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1953. З 1957 звеннявая па вырошчванні лёну ў калгасе «Світанне» Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл. На XXIV з'ездзе КПБ выбрана канд. у чл. ЦК. Узнаг. ордэнам Леніна, медалямі.

КАРАНЕЎСКІ Іван Фёдаравіч [13(26).11.1905, в. Усвея Лепельскага пав. Віцебскай губ.— 4.5.1944], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Віцебскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1926. Скончыў Кіеўскую артыл. школу (1929). З 1919 рабочы. У 1925—33 у Чырв. Арміі. З 1933 на пед., сав. і парт. рабоце ў Сухінічах, Бешанковічах. З 1940 сакратар Дрысенскага, Гарадоцкага райкомаў КП(б)Б. У партызанах з мая 1942, з чэрв. 1942 камісар *партызанскай брыгады імя В. І. Чапаева* Віцебскай вобл., адначасова сакратар Ушацкага падпольнага райкома КП(б)Б. Загінуў у баі. Узнаг. ордэнам Чырв. Сцяга, медалём.

КАРАНЁВА (Каранёўскае, Святое), возера ў бас. Зах. Дзвіны, у Бешанковіцкім р-не Віцебскай вобл. Пл. 0,58 км². Даўж. 1,4 км, найб. шыр. 0,5 км, сярэдняя 0,4 км, найб. глыб. 27 м. Катлавіна выцягнута з ПнЗ на ПдУ. Схілы высокія, большая ч. парасла лесам, на ПнЗ пад ворывам. Вадазбор (2,9 км²) нізінны. Сцёк у Зах. Дзвіну. Водзіца плотка, шчупак, акунь, лешч.

КАРАНІ, вёска ў Смаргонскім р-не Гродзенскай вобл., каля р. Віля (3 км). Цэнтр сельсавета і калгаса імя Калініна. За 2 км на ПнЗ ад Смаргоні, 258 км ад Гродна, каля аўтамаб. дарогі Маладзечна — Вільнюс (1 км). 229 ж., двароў 79 (1971). Пач. школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, вет. пункт, аддз. сувязі. Помнік 22 сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну.

КАРАНЦІН [італьян. quaranta giorni сорак дзён (на працягу іх у Італіі ў 14 ст. трымалі на рэйдзе судны, якія прыбылі з небяспечнай па чуме мясцовасці)], комплекс адм.-санітарных і медыка-санітарных мерапрыемстваў, накіраваных на ізаляцыю эпідэмічнага ачага, каб папярэдзіць пашырэнне і ліквідаваць *інфекцыйныя хваробы* ў ім.

Аб'ём мерапрыемстваў і парадак іх ажыццяўлення вызначаны «Правіламі санітарнай аховы граніц СССР» (1967), распрацаванымі на аснове Міжнар. сан. канвенцый у адносінах чумы, халеры, жоўтай ліхаманкі, воспы натуральнай, сыпнога і зваротнага тыфаў (карантынныя інфекцыі). Мерапрыемствы адм.-санітарныя: забарона прыезду і выезду за межы СССР, прыёму пасылак з-за мяжы, закрыццё дзярж. граніц і інш.; медыка-санітарныя: агляд пасажыраў і экіпажаў, ізаляцыя падозроных на хваробу і хворых, абсервацыя асоб, якія былі ў кантакце з хворымі, прышчэпкі. Пры ўзнікненні асабліва небяспечных інфекц. хвароб на К. пераводзяцца асобныя порты, чыг. станцыі, нас. пункты для ізаляцыі ад навакольных тэрыторый. У штодзённай практыцы санітарныя органы К. бывае пры інш. інфекц. хваробах (не карантынных) у дзіцячых установах. Працягласць К. не меншая, чым максімальны інкубацыйны перыяд хваробы.

Літ.: Эпидемиология, 2 изд., М., 1968.

КАРАНЦІН у сельскай гаспадарцы, 1) К. ветэрынарны — сістэма абмежавальных мерапрыемстваў, каб папярэдзіць запясенне і пашырэнне інфекцыйных хвароб жывёл. На Беларусі першае карантыннае аддзяленне арганізавана ў 1825 у Магілёве. Адзіныя карантынныя мерапрыемствы ўпершыню зацверджаны Вет. статутам БССР (1924). З 1936 карантынныя мерапрыемствы праводзяцца паводле Вет. статута СССР. К. устанаўліваецца і знімаецца выканкомамі раённых (гарадскіх) Саветаў дэп. працоўных. К. устанаўліваюць пры сібірскай язве, сапе, яшчуры, шаленстве, чуме і інш.

К. бывае прафілактычны і пры выяўленні інфекц. хваробы. Прафілактычны 30-дзённы К. праходзяць жывёлы, якія завозяцца з інш. гаспадарак, раёнаў краіны або з-за мяжы. Задача яго — выявіць жывёлу са скрытым перыядам хваробы і не пусціць яе ў статак, на пашу і вадапой. Пры выяўленні інфекц. хваробы К. устанаўліваюць на частцы тэр. (двор, ферма, пчальнік, сажалка) або ва ўсёй гаспадарцы, нас. пункце ці раёне.

2) К. раслін — сістэма дзярж. мерапрыемстваў па ахове тэрыторыі ад пранікнення з інш. дзяржаў небяспечных шкоднікаў, узбуджальнікаў хвароб і злоснага пустазелля, па ліквідацыі ачагоў заражэння. У СССР карантынная служба арганізавана ў 1931. Яе задачы: экспертыза замежных раслінных грузаў; абследаванне пасеваў, пасадак, складаў, тэрыторый пунктаў завозу; кантроль за выкананнем правілаў К.; ліквідацыя ачагоў заражэння.

Аб'екты К., небяспечныя для Беларусі: шкоднікі — каларадскі жук, амер. белы матылёк, калійфарыйская шчытоўка, усходняя пладажэрка і інш.; пустазелле — амброзія палынналістая і трохраздзельная, пустазельны слапечнік, павітухі і інш. Карантынныя хваробы — рак бульбы, бульбяная нематода, апёк пладовых дрэў, пасма лёну, воспа сліў і інш.

Літ.: Ветеринарный устав Союза ССР, М., 1968; Гинзбург А. Г. и Иванов А. Д. Организация ветеринарного дела в СССР, 2 изд., М., 1970; Гореглядов С. и Карягин В. И. Развитие ветеринарии в Белоруссии, Мн., 1969; Устав государственной службы по карантину растений в СССР, Мн., 1964. *В. І. Каразін, А. Г. Васільчанка.* Мінск.

КАРАНЯЁД БУРАКОЎ, хвароба буракоў, якая выклікаецца грыбамі і бактэрыямі, пашкоджвае прасткі і карэньчыкі маладых раслін. Узбуджальнікі жывуць на раслінных рэштках у глебе, асноўныя з іх — ніжэйшыя грыбы Pythium de Baryanum і Aphanomyces cochlioides.

У хворых раслін на карэньчыках і падсемядольным калене паяўляюцца бурыя плямы і палоскі, утвараюцца перацяжкі; карані чарнеюць, танчэюць. Вельмі пашкоджаныя расліны гінуць, пасевы радзеюць. Хваробе спрыяюць высокая вільготнасць глебы і дрэнная аэрацыя. Меры барацьбы: правільная агратэхніка, спрыяльны водна-паветраны рэжым, пратручванне насення.

Літ.: Шевченко В. Н. и Пожар З. А. Болезни сахарной свеклы и борьба с ними, М., 1958; Дорожкин Н. А., Горовец В. К. и Терехова Т. П. Вредители и болезни сахарной свеклы, Мн., 1957. *В. К. Гаравец.* Мінск.

КАРАНЯНОЖКІ (Rhizopoda), падклас прасцейшых жывёл кл. саркодавых. Каля 2 тыс. відаў, якія аб'ядноўваюць у 3 атрады: *амёбы*, ракавінныя К. і *фарамініферы*. Жывуць ў прэсных і марскіх вадаёмах. Трапляюцца ў глебе.

Памеры К. — ад некалькіх *мкм* да 3 *мм* (сучасныя формы) і да 5 *см* (выкапнёвыя формы).



1. Ракавінная карняножка эўгліфа з псеўдаподыямі.
2. Ракавінка эўгліфы.

К. вадольныя ўтвараць часовыя выросты — несапраўдныя ножкі (псеўдаподы), з дапамогай якіх перамяшчаюцца і захопліваюць ежу. У целе адрозніваюць паверхневы, гамагенны слой — эктаплазму і ўнутраны зярністы — эндаплазму, у якім ёсць ядро, пульсавальныя і стрававальныя вакуолі і інш. ўключэнні. Ракавінныя К. і фарамініферы маюць шкілет (ракавіну). Корміцца К. бактэрыямі і водарасцямі. Размнажэнне бясполае і полавае. Некат. віды — паразіты жывёл і чалавека.

Літ.: Жизнь животных, т. 1, М., 1968. *Ю. С. Патаенка.* Мінск.

КАРАНЯПЛОДЫ, расліны, якія вырошчваюць для атрымання сакавітых каранёў. Належаць да сямействаў: парасонавых — *морква, пятрушка, пастарнак, сельдэрэй*; крыжакветных — *рэпа, бручка, радыска, турнэпс, рэдзька*; лебядовых — *буракі*; складанакветных — *цыкорый*. Гл. таксама *Кармавыя каранеплоды*.

КАРАСЁЎ Аляксей Маркавіч (10.12.1920, в. Дравасекава Вялікалуцкага пав. Пскоўскай губ.— 9.1.1964), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1942. На фронце з 1941 — ст. сяржант, камандзір кулямётнага разліку. К. вызначыўся 27.7.1944. Заняў вручную пазіцыю на вышыні Безыменнай і агнём з кулямёта адбіў 16 контратак гітлераўцаў, якія прарываліся на З з Брэсцкага «катла».



КАРАСЁЎ Віктар Аляксандравіч (н. 26.3.1918, г. Ялец Арлоўскай губ.), удзельнік партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). З рабочых. Чл. КПСС з 1941. Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1949). У Чырв. Арміі з 1935. У вер.— снеж. 1941 камандзір спец. партыз. атрада. 24.11.1941 разам з інш. атрадамі ў с. Угодскі Завод Калужскай вобл. разграміў штаб 12-га корпуса ням. войск, захапіў важныя дакументы. Партызаны знішчылі 600 гітлераўцаў, склад з гаруча, аўтарамонтную базу, 103 аўтамашыны, 4 танкі. З вер. 1942 камандзір спец. партыз. атрада НКДБ СССР *«Алімп»*, які з 11.2.1943 да 13.2.1945 праводзіў дыверсіі ў Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай, Гомельскай, Брэсцкай абл., на Украіне, у Польшчы, Чэхаславакіі, Венгрыі. Ганаровы грамадзянін г. Оўруч (СССР), 2 гарадоў ПНР, 6 — ЧССР.

Літ.: Семиряга М. И. Советские люди в европейском Сопротивлении, М., 1970; Чекисты, М., 1970; Самойлов Л. и Скорбин Б. Пароль — Родина, 2 изд., Калуга, 1960.

КАРАСЁЎ Іван Пятровіч [н. 20.7(2.8).1909, с. Кермісь Шацкага пав. Тамбоўскай губ.], беларускі савецкі геолаг. Д-р геолага-мінералаг. н. (1963), праф. (1964). Чл. КПСС з 1939. Да 1966 працаваў у нафтавых арг-цыях Баку, Грознага, Масквы, Уфы, Новасібірска, Іркуцка. Нам. дырэктара (1966—70), з 1970 заг. лабараторыі фізікі пласта Бел. н.-д. геолагаразведачнага ін-та. Гал. кірунак навук. дзейнасці — нафтавая геалогія. Вывучаў геал. будову і перспектывы нафтагазаноснасці Каўказа, Урала, Крыма, Сібіры, БССР. Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі.

Тв.: (У сааўт.) Геологическое строение юга Сибирской платформы и нефтегазоносность кембрия, М., 1957; Перспективы нефтегазоносности Восточно-Сибирской платформы, М., 1968; Геология и нефтегазоносность юга Восточной Сибири, М., 1969; Геология и нефтеносность территории Белоруссии и смежных районов, Мн., 1969.



КАРАСЁЎ Іван Раманавіч (2.5.1922, в. Вілейка Чавускага пав. Гомельскай губ.— 7.11.1955), Герой Сав. Саюза (1943). З сялян. Чл. КПСС з 1944. У Айч.

вайну на Паўн.-Зах., Сцяпным, 1-м Укр. франтах — камандзір аддзялення сувязі. Удзельнік баёў на Курскай дузе, Корсунь-Шаўчэнкаўскай аперацыі, вызвалення Харкава, Сумаў, Жытоміра, Малдаўскай ССР, Румыніі, Венгрыі. Вызначыўся 2.10.1943 пры фарсіраванні Дняпра каля Кіева. У ліку першых з тэлефонным апаратам пераправіўся на правы бераг і пад варожым агнём наладзіў сувязь дэсанта з КП палка. За двое сутак выправіў 27 пашкоджанняў тэлефоннай сувязі.

КАРАСЁУ Рыгор Сцяпанавіч [н. 6(18).1. 1895, в. Хорастава Мазырскага пав. Мінскай губ.], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Пінскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1930. Скончыў Вышэйшую камуніст. с.-г. школу Беларусі імя Леніна (1936). У 1917—22 у Чырв. гвардыі, Чырв. Арміі, удзельнік грамадз. вайны. У 1926—41 чл. камуны, трактарыст у Старобінскім, старшыня калгаса ў Любанскім р-нах, кіраўнік птушкакамбіната ў Пінску. У партызанах з чэрв. 1941 — камандзір аддзялення, атрада; з мая 1944 камісар *партызанскай брыгады імя С. М. Будзённага* Пінскай вобл. У 1944 сакратар Пінскага РК КП(б)Б, з 1945 на сав. і гасп. рабоце. Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі. Жыве ў Пінску.

КАРАСІ (Carassius), род прэснаводных рыб сям. *карпавых*. 2 віды — К. залаты, або звычайны (C. carassius), і К. сярэбраны (C. auratus), пашыраныя ў прэсных водах Еўропы і Азіі. На Беларусі К.— аб'ект промыслу, сажалкавай і азёрнай рыбагадоўлі.

Даўж. цела да 45 *см*. Маса 1—3, зрэдку 5 *кг*. У К. залатога спіна цёмна-карычневая, бакі жоўта-залацістыя, плаўнікі чырванаватыя, бруха светлае. К. сярэбраны больш светлы, серабрысты. Палавая спеласць настае на 2—5-м годзе жыцця. Ікру адкладваюць порцыямі ў маі — чэрвені. Кормяцца пасякомымі, іх лічынкамі і інш. дробнымі беспазваночнымі, водарасцямі. На зіму закопваюцца ў іл. Ад К. сярэбранага выведзены акварыумныя рыбы: тэлескоп, вуалехвост і інш. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Рыбы*.

КАРАСІ, вёска ў Глыбоцкім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр Старынкаўскага с/с. За 52 *км* на ПнУ ад Глыбокага, 148 *км* ад Віцебска, 5 *км* ад чыг. ст. Загацце, на аўтамаб. дарозе Глыбокае — Полацк. 68 ж., двароў 26 (1971). Магазін.

КАРАСІНА, вёска ў Мяжанскім с/с Браслаўскага р-на Віцебскай вобл., на беразе воз. Карасіна. Цэнтр калгаса «Камунар». За 28 *км* на З ад Браслава, 258 *км* ад Віцебска, 18 *км* ад чыг. ст. Турмантас (Літ. ССР), на аўтамаб. дарозе, якая злучае вёску з Браславам. 181 ж., гасп. 51 (1971). Лесапільня, швейная майстэрня. Васьмігадовая школа, клуб, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін.

КАРАСЛАВАЎ Георгі (н. 12.1.1904, в. Дэбыр Плоўдзіўскай акр.), балгарскі пісьменнік і грамадскі дзеяч. Акад. Балгарскай АН (1961). Чл. БКП з 1924. З сялян. З пач. 20-х г. удзельнічаў у рэвалюц. руху. Першы зб. апавяданняў «Беспрытульнікі» (1926). У даваен. творчасці адлюстроўваў сац. канфлікты ў балг. вёсцы, рост рэвалюц. свядомасці сялян (зб. апавяданняў «Жалейка плача», 1927; «На варце», 1932; раманы «Дурман», 1938; «Нявестка», 1942; і інш.). Цыкл раманаў «Простыя людзі» (ч. 1—4, 1952—66, незаконч.) — эпапея жыцця балг. народа ад 1-й сусв. вайны да вер. 1944. Аўтар п'ес «Таберавы» (1955), «Камень у балота» (1959), «Голас народа» (1963), «Лепін заходзіць у нашую хату» (1970). Дзімітроўская прэмія 1950, 1959.

Тв.: Бел. пер.— Нявестка. Мн., 1966; У кн.: Скарб, Мн., 1967; рус. пер.— Избранное. М., 1958; Дурман, М., 1958; Пробуждение. М., 1961; Чистые сердца, М., 1966; Зарево, М., 1969.

Н. С. Гілевіч. Мінск.

КАРАСТАЯНАВА Лілія Аляксандраўна (22. 5. 1917, г. Лом, Балгарыя — 6.2.1943), беларуская партызанка, журналістка. Чл. ВЛКСМ. З сям'і балгарскіх рэвалюцыянераў; за ўдзел у Вераснёўскім антыфаш. паўстанні 1923 бацька расстраляны, маці разам з дзецьмі аднаволена ў турму. З 1927 у СССР, выхоўвалася ў сям'і Е. М. Яраслаўскага. З 1938 у рэдакцыі газ. «Комсомольская правда». У Айч. вайну спец. карэспандэнт газеты, з ліст. 1942 у партыз. атрадах на Браншчыне і Беларусі. Загінула ў баі з фашыстамі каля в. Будзішча Чачэрскага р-на Гомельскай вобл. Пахавана ў брацкай магіле ў Чачэрску. Узнаг. ордэнам Айч. Вайны 2-й ступені.

КАРАСЬК, рака ў Новасібірскай вобл. РСФСР. Даўж. 531 *км*, пл. бас. 14,7 тыс. км². Пачынаецца на Обска-Чанскім водападзеле, цячэ па шырокай даліне ў Кулундзінскім стэпе. Жыўленне пераважна снегавое. Рака губляецца ў балоце на ПдЗ ад г. Карасук.

КАРАТ (араб. кірат, ад грэч. kerátion струкаваго дрэва), пазасістэмная адзінка масы, роўная 0,2 *г* ($2 \cdot 10^{-4}$ *кг* у *Міжнароднай сістэме адзінак*). Ужываецца толькі ў дастасаванні да каштоўных камянёў.

КАРАТАЕЎ Герман Іванавіч (н. 3.10.1931, г. Балаганск Іркуцкай вобл.), савецкі геафізік і геолаг. Д-р геолага-мінералаг. н. (1968), праф. (1971). Да 1971 выкладаў у Новасібірскім ун-це і працаваў у Сібірскім аддз. АН СССР, з 1971 заг. сектара матэм. метадаў даследаванняў у Бел. н.-д. геолагаразведачным ін-це. Распрацаваў карэляцыйную тэорыю комплекснай геал. інтэрпрэтацыі аномальных геафіз. палёў і тэорыю інтэрпрэтацыі варыяцый гравітацыйных і магнітных палёў у часе.

Тв.: Корреляционная схема геологической интерпретации гравитационных и магнитных аномалий, М., 1966; (у сааўт.) Моделирование процесса геологической интерпретации гравитационных и магнитных аномалий на электронных цифровых машинах, Новосибирск, 1970.

КАРАТАЖ (прамысловая геафізіка), сукупнасць геафізічных метадаў даследавання ў свідравінах для вывучэння геалагічнага разрэзу, а таксама кантроль за тэхнічным станам свідравін. У залежнасці ад фіз. параметра горнай пароды, які выкарыстоўваюць для вызначэння пластоў у геал. разрэзе, вылучаюць К. электрычны, радыеактыўны, акустычны, магнітны, газавы, механічны і інш. Існуюць разнавіднасці і мадыфікацыі відаў і метадаў К. Тэхн. стан свідравіны вызначаюць *інклінаметрыя, кавернаметрыя* і інш. К. дае магчымасць супаставіць геал. разрэзы свідравін, удакладніць літалагічны састаў горных парод, *кантакты геалагічныя*, вылучыць пласты вугалёў, калійныя солі, рудаазмяшчальныя пласты, пласты-калектары газу і нафты, вызначыць іх парыстасць, нафтагазанасычанасць, магутнасць. К.— адзін з асн. і абавязковых відаў геал. дакументацыі свідравін пры геал. пошуках, разведцы і эксплуатацыі радовішчаў карысных выкапняў. К. змяншае неабходнасць адбору ўзораў пародаў (керну), што зніжае затраты на прабіванне свідравін.

Для правядзення К. ў свідравіну на спец. кабелі спускаюць вымяральную ўстаноўку (свідравальную прыладу электрычнага, акустычнага, радыеактыўнага, магнітнага і інш. К.). Паказанні яе пры перамяшчэнні па свідравіне запісваюцца на зямной паверхні рэгістравальнай апаратурай каратажнай станцыі ў выглядзе спец. дыяграм — каратажных крывых (гл. рыс.). Дыяграмы розных відаў К. інтэрпрэтуюцца ў комплексе.



1 2 3 4 5 6 7 8

Каратажныя дыяграмы і геалагічны разрэз свідравіны: *1* — соль; *2* — ангідрыт; *3* — гліна; *4* — нафта; *5* — вапняк; *6* — вапняк гліністы; *7* — вапняк брэкчыяпадобны; *8* — вада; *а*, *б* — дыяграмы электрычнага каратажу; *в*, *г* — дыяграмы радыеактыўнага каратажу; *д* — кавернаграма.

Літ.: Комаров С. Г. Геофизические методы исследования скважин, М., 1963; Дахнов В. Н. Интерпретация результатов геофизических исследований разрезов скважин, 2 изд., М., 1962; Ферронский В. И. Пенетрационно-каротажные методы инженерно-геологических исследований. М., 1969; Справочник геофизика, т. 2, М., 1961; Пирсон С. Д. Справочник по интерпретации данных каротажа, пер. с англ., М., 1966.

І. І. Луцкевіч. Мінск.

КАРАТКАШЭРСНЫЯ, народная група трусоў з кароткім шчыльным валасяным покрывам, выведзеная ў Бірулінскім зверасӑгасе (Тат. АССР). Шкуркі выкарыстоўваюцца натуральныя і імітуюцца пад каш. пушніну.

Даўж. асцюковых і пуховых валокнаў поўсці адпаліраваў, таму футра К. трусоў падобна да футра марскога коціка. Яно мяккае, аксаміцістае; блакітнае, белае, серабрыстае, карычневае, чорнабурае, чорнае. Жывая маса трусоў 4—5 *кг*, плоднасць 5—6 трусянят за атрусенне. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Трусагадоўля*.

Літ.: Основы кролиководства, М., 1961.

КАРАТКЕВІЧ Васіль Апанасавіч (5.12. 1909. в. Вішар Мазырскага пав. Мінскай губ.— 8.1.1972), адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Палескай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1947. Скончыў Мінскі пед. ін-т імя М. Горкага (1950). З ліст. 1941 чл. падпольнай антыфаш. групы К. М. Бакуна ў Калінкавічах; з 16.1.1942 у партызанах — радавы, палітрук роты, нач. штаба, камісар атрада; з мая 1943 камандзір *партызанскай брыгады 99-й Калінкавіцкай* Палескай вобл., адначасова сакратар Калінкавіцкага падпольнага райкома КП(б)Б. Пасля вайны на парт., прафс. і пед. рабоце ў Пінскай вобл., Мінску, старшыня калгаса ў Бягомльскім р-не. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.

КАРАТКЕВІЧ Дзмітрый Андрэевіч (1904, Аршанскі пав. Магілёўскай губ.— 1943), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Мінскага камуністычнага падполля ў Айч. вайну. З рабкаў. Чл. КПСС з 1928. Скончыў Вышэйшую школу прапагандыстаў пры ЦК КП(б)Б (1937). З 1926 на сав. і прафс. рабоце ў Талачынскім р-не, у органах міліцыі; з 1937 першы сакратар Заслаўскага РК КП(б)Б Мінскай вобл. У 1939—40 нам. нач. Галоўгандлю, дырэктар Мінскага прамгандлю. З жн. 1941 удзельнічаў у стварэнні, у маі — вер. 1942 чл. *Мінскага камуністычнага падполля*, чл. Мінскага падпольнага к-та КП(б)Б. У кастр. 1942 гітлераўцы арыштавалі К. і закатавалі. Узнаг. ордэнам Айч. Вайны 1-й ступені.

Літ.: О партийном подполье в Минске в годы Великой Отечественной войны, Мн., 1961.

В. С. Давыдава. Мінск.

КАРАТКЕВІЧ Уладзімір Сямёнавіч (н. 26. 11.1930, Орша), беларускі савецкі пісьменнік. З сям'і служачага. Скончыў філал. ф-т Кіеўскага ун-та (1954), Выш. літаратурныя (1960) і сцэнарныя (1962) курсы ў Маскве. Друкуецца з 1955. Першы зб. паэзіі «Матчына душа» (1958), прозы «Блакіт і золата дня» (1961). Аўтар раманаў «Нельга забыць» (1962), аповесцей «Цыганскі кароль», «Сівая легенда» (апубл. 1961), «Дзікае паляванне караля Стаха» (1964), «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» (1966), «Чазенія» (1970), п'есы «Млын на Сініх Вірах» (пап. 1957, паст. Бел. тэлебачаннем 1959), сцэнарыяў фільмаў «Сведкі вечнасці» (1964), «Памяць» (1966), «Будзь шчаслівай, рака» (1967) і інш. У паэзіі К. пераважаюць гістар. і баладна-рамант. сюжэты, ёй характэрна рамантычна-асацыятыўная вобразнасць. Гістарычная тэматыка, рамантызавана-прыгодніцкія сюжэты пераважаюць і ў прозе К., у якой вылучаецца раман пра адмену прыгону і паўстанне К. Каліноўскага «Каласы над сярпом тваім» (кн. 1—2, 1965). Творы К. перакл. на рус., укр., літ., чэшскую, балг. і інш. мовы.



Тв.: Вячэрнія ветразі, Мн., 1960; Каласы над сярпом тваім, т. 1—2, Мн., 1968; Мая Ілліяда, Мн., 1969; Чазенія, Мн., 1970; Дарога, якую прайшоў, у кн.: Пра час і пра сябе, Мн., 1966.

Літ.: Колесник В. Душа поэта, «Дружба народов», 1959, № 8; Лойка А. Выхаванне таленту, «Маладосць», 1961, № 7; Кісялёў Г. Шматпланавы гістарычны раман, «Полымя», 1969, № 12; Ярош М. Добры плён пошукаў, там жа, 1970, № 2; Андраюк С. На рамантычнай хвалі, там жа, 1971, № 5. *А. А. Лойка.* Мінск.

КАРАТКОЎ Аляксей Іванавіч (1904, в. Звягіна Пашахонскага пав. Яраслаўскай губ.— 6.10.1943), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). На фронце з 1941, кулямётчык. Вызначыўся ў кастр. 1943 у Віцебскай вобл. У баі за в. Нова-Аляксееўку знішчыў варожы кулямёт з разлікам, гэтым расчысціў шлях для атакі. У час бою закрыў сабою камандзіра.

КАРАТКОЎ Пётр Іванавіч [н. 2(15).9.1915, в. Яромкіна Хвалынскага пав. Саратаўскай губ.], наватар нафтаперапрацоўчай прамысловасці, лаўрэат Дзярж. прэміі СССР (1970). Чл. КПСС з 1956. Скончыў Грозненскі нафтавы ін-т (1940). Удзельнік Айч. вайны. З 1964 дырэктар Полацкага нафтаперапрацоўчага з-да. Дзярж. прэмія СССР прысуджана за стварэнне і прамысл. ўкараненне высокапрадукцыйнай устаноўкі першапачатковай перапрацоўкі нафты магутнасцю 6 млн. *т* за год. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Кастр. Рэвалюцыі, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.

Тв.: (У сааўт.) Производство смазочных масел из сернистых нефтей, М., 1959; Из нефти, Рязань, 1961.

КАРАТЫГІН Васіль Андрэевіч [26.2(10.3). 1802, Пецярбург — 13(25).3.1853], рускі акцёр-трагік, найбуйнейшы прадстаўнік класіцызму. З 1820 у Пецярбургскім Вялікім т-ры, з 1832 у Александрынскім т-ры. Выступаў у класіцысцкіх трагедыях У. Озерава, П. Карнеля, Ж. Расіна, меладрамах, у п'есах У. Шэкспіра, Ф. Шылера. Характэрныя рысы стылю К.— прыўзнятая гераіка, манументальная параднасць, эфектнасць, грацыёзнасць і прыгажосць рухаў, напеўная дэкламацыя. Перадавая крытыка, у т. л. В. Бялінскі, проціпастаўляла К. дэмакр. творчасць П. Мачалава. З канца 30-х г. мастацтва К. стала больш натуральнае і простае. У 1845—46 гастраляваў у Мінску.



Літ.: Белинский В. Г. И мое мнение об игре г. Каратыгина, Полн. собр. соч., т. 1, М., 1953; Каратыгин П. А. Записки, Л., 1970.

КАРАТЫНСКІ Вінцэсь Аляксандравіч (15. 8.1831, в. Селішча Навагрудскага пав. Віленскай губ.— 7.2.1891), беларускі і польскі пісьменнік і журналіст. З сялян. Адукацыю набыў самастойна. Працаваў хатнім настаўнікам, сакратаром У. Сыракомлі. Друкавацца пачаў у 1856. З 1857 супрацоўнік час. «Teka Wileńska» («Віленскі зборнік») і газ. «Kuryer Wileński» («Віленскі кур'ер»). З 1866 у Варшаве, супрацоўнік розных перыяд. выданняў, друкаваў у іх артыкулы пра Беларусь. Аўтар бел. вершаў «Уставайма, браццы, да дзела, да дзела», «У альбом А. Вярыгі-Дарэўскага», элегіі «Туга на чужой стране», якія выгучаюцца танічнасцю. Інш. бел. творы не збяргліся. У л-ры выказваецца меркаванне, што К. быў аўтарам *«Гутаркі старога дзеда»*. Выступаў за рэаліст., дзейснае мастацтва. Дэмакр. погляды К. найб. выявіліся ў польскіх творах пра жыццё бел. вёскі — у вершаваным аб. «Чым хата багата, тым рада» (Вільня, 1857), паэме «Таміла» (Вільня, 1858). Выдаў 10-томны збор твораў Сыракомлі (1872).

Тв.: Wypis Kuba do Jakuba, Wilno, 1859; Kilka szczegółów o rodzinie, miejscu urodzenia i młodości Adama Mickiewicza, Wilno, 1860; Salomon Ryński, Wilno, 1863.

Літ.: Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры, т. 2, Мн., 1969, с. 44—46; Вінцэнт Каратынскі, «Беларусь», 1946, № 7; Мальдзіс А. Падарожжа ў XIX стагоддзе, Мн., 1969. *А. І. Мальдзіс.* Мінск.

КАРАЦІНОІДЫ (лац. carota морква+грэч. eidos від), жоўтыя, аранжавыя ці чырвоныя прыродныя пігменты, якія ёсць у тканках вышэйшых раслін, водарасцях, грыбах і бактэрыях. Да іх належаць *каратыны* і ксантафілы (гідраксівытворныя каратыноў).

К. добра растваральніках. У арганізмах жывёл і чалавека не сінтэзуюцца, паступаюць з раслінной ядою і з'яляюцца выходным матэрыялам для ўтварэння вітаміну А і зрокавага пурпуру. Ужываюцца ў медыцыне, харч. прамысл., жывёлагадоўлі (вітамінныя дамешкі).

Літ.: Вечер А. С. Пластиды растений, их свойства, состав и строение, Мн., 1961; Гуквин Т. Сравнительная биохимия каротиноидов, пер. с англ., М., 1954.

КАРАЦІНЫ (лац. carota морква), $C_{40}H_{56}$, ненасычаныя вуглевадароды з групы *каратаноідаў*, аранжава-жоўтыя пігменты. Да іх належаць α-, β-, γ-К., лікапін — асн. пігмент таматаў і інш. Найб. біял. значэнне мае β-К. (з яго малекулы ў арганізме жывёл і чалавека ўтвараюцца 2 малекулы вітаміну А). Многа β-К. ў моркве, абрыкосах, у зялёным лісці раслін.

К.— цёмна-чырвоныя з метал. бляскам крышталі. Т-ра пл. 178—188 °С. Лёгка далучаюць кіслар., асабліва на святле, пры награванні, і ўтвараюць бясколерныя рэчывы. Вызначаюць К. металы храматаграфіі і спектрафотаметры. У прамысловасці атрымліваюць з раслінной сыравіны, а таксама шляхам хім. і мікрабіял. сінтэзу. Прэпараты выкарыстоўваюць пры авітамінозах. У лабараторыі біяхіміі і малекулярнай біялогіі Ін-та эксперым. батанікі АН БССР распрацаваны спосабы палепшэння колеру і харч. каштоўнасці сыроў, сметаны, алівкавага масла дабаўленнем невялікай колькасці К. *А. М. Кулікова.* Мінск.

КАРАЧАЕВА-ЧЭРКЕССКАЯ АЎТАНОМНАЯ ВОБЛАСЦЬ, у складзе Стаўрапольскага краю РСФСР. Утв. 12.1.1922. Размешчана на паўн. схіле Вял. Каўказа ў верхнім цячэнні Кубані. Пл. 14,1 тыс. км². Нас. 347 тыс. чал. (1971). Падзяляецца на 7 раёнаў; 3 гарады, 8 гар. пасёлкаў. Цэнтр Чэркеск.

Больш за ⅔ тэр. займаюць горы і перадгор'і на Пн раўніна і перадгор'і, на Пд хрыбты: Галоўны і Бакавы з вяршыняй Эльбрус (5642 м, на мяжы з Кабардзіна-Балкарскай АССР). Карысныя выкапні: медна-калчаданавая і поліметалічныя руды, кам. вугаль, барыт, вогнетрывалыя гліны, мергель, граніт, мармур, гіпс. Мінер. крыніцы. Кліматычны курорт Цеберда, курорты Кісловодск, Ессентукі, Пяцігорск, Ніжні Архыз, Джэгута, Учкекен, Эльбрусі. Турызм. Цэнтр. ўсесаюзны пункт па вывучэнні высокагор. раёнаў. Ін-т, 2 тэхнікумы, 4 прафес.-тэхн. вучылішчы, 4 сярэднія спец. навуч. ўстановы, 2 бібліятэкі, 2 музеі, 2 тэатры, Абл. газеты: «Ленинин байрагъы» («Сцяг Леніна») на карачаеўскай мове, «Ленин нур» («Ленінскі прамень») на чэркескай мове, «Ленин йолы» («Ленінскі шлях») на нагайскай мове, «Коммунизм алашара» («Свет камунізма») на абазінскай мове, «Ленинское знамя».



Вусная творчасць народаў К.-Ч. а. в. вызначаецца разнастайнасцю жанраў. Найбольш старажытны помнік *Нарцкі эпас*. Л-ру ствараюць чатыры карэнныя народы — карачаеўцы, чэркесы, абазінцы, нагайцы. Пісьменнасць створана ў 1924. Паявіліся першыя творы маст. л-ры (вершы, нарысы). Маст. проза ўзнікла ў 30-я г. Вядомыя творы А. Уртэнава, І. Каракетава, Д. Байкулава, Ф. Абдулжалілава, Х. Гашокава, А. Охтава, П. Цэкава, Х. Аппаева, Х. Байрамукавай і інш.

Літ.: Российская Федерация. Европейский Юго-Восток, М., 1968 (Советский Союз); Ставрополье за 50 лет, Ставрополь, 1968; Караева А. Н. Очерк истории карачаевской литературы, М., 1966; Бекизова Л. А. Черкесская советская литература, Ставрополь, 1964; Тугов В. Б. Очерки истории абазинской литературы, Черкесск, 1970. *У. І. Гладкі.* Мінск; *І. К. Галкіна* (літаратура). Масква.

КАРАЧАН Ева Раманаўна (н. 28.11.1920, в. Вірышча Навагрудскага пав. і ваяводства), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1958). Чл. КПСС з 1963. У 1940—41 трактарыстка Нягневіцкай МТС Любчанскага р-на Баранавіцкай вобл. У 1947—53 калгасніца, з 1953 звеннявая па вырошчванні лёну калгаса «Новае жыццё» Карэліцкага р-на Гродзенскай вобл. Дэп. Вярх. Савета СССР 5—6-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Кастр. Рэвалюцыі, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі.



Літ.: Бялевіч А. П. Запольская чараўніца, у яго кн.: Залатыя ключы, Мн., 1963; Клімянцепка С. Звычайны летні дзень, у кн.: Сцяганосцы новага, перадавога, Мн., 1967.

КАРАЧАРАЎ Іван Мікалаевіч [16(29).8.1903, с. Багатае Абаянскага пав. Курскай губ.— 15.10.1943], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). На фронце з 1943. Вызначыўся ў кастр. 1943 пры фарсіраванні Дняпра непадалёку ад г. п. Лоева Гомельскай вобл. Паранены ў час пераправы К. даплыў да правага берага, уварваўся ў варожыя траншэі і закідаў гітлераўцаў гранатамі. Загінуў у баі.

КАРАЧОЎ Міхаіл Васілевіч (1908, с. Рускі Нолінскага пав. Вяцкай губ.— 1958), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой

Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1942. Разведчык-назіральнік К. вызначыўся на тэр. Віцебскай вобл. 26.6.1944 пераправіўся цераз Зах. Дзвіну каля Улы і карэкціраваў агонь мінамётных батарэй. Паранены не пакінуў поля бою.

КАРАЧУН, у рускіх нар. вераваннях міфал. вобраз, злы дух, смерць. У стараж. славян — божышча, што «караціла» ноч, несла пагібель зіме; яго ўшаноўвалі святкаваннем у час зімовага сонцастаяння. Сляды культу К. зберагліся ў некат. рус. гаворках, дзе К.— назва дня 12 снежня с. ст. (Спірыдонаў дзень, Сонцаварот; бел. Спірыдон-сонцаварот).

КАРАЧУН Уладзімір Рыгоравіч [н. 1(14).3. 1914, в. Кухцічы Ігуменскага пав. Мінскай губ.], Герой Сав. Саюза (1946). З сялян. Чл. КПСС з 1943. У Айч. вайну на фронце, з 17.4.1943 камандзір эскадрыллі штурмавікоў. Ваяваў на Паўд., 4-м Укр., 3, 1, 2-м Прыбалт. і Ленінградскім франтах. Зрабіў 133 баявыя вылеты. З 1957 падпалкоўнік К. у запасе. Жыве ў Мелітопалі.



КАРА́ЧЫ, найбольшы горад Пакістана. Каля дэльты р. Інд. Узнік у пач. 18 ст. на месцы рыбацкага пасёлка белуджаў. У 1843 захоплены англ. каланізатарамі, адм. ц. правінцыі Сінд. У 1947—59 сталіца Пакістана. Чыгункай злучаны з найб. гарадамі краіны і Індыі. Вузел міжнар. авіяшляхоў. Порт (каля $^2/_3$ марскога знешнегандл. абароту краіны; экспарт бавоўны, скур, шэрсці; імпарт вугалю, нафтапрадуктаў, машын, абсталявання, хімікатаў). 3 млн. ж. (1969). Праўленні найб. банкаў, фірмаў і гандл. кампаній; баваўняная біржа. Тэкст., харч., цэментавая, запалкавая, абутковая прамысловасць; аўтазборачныя і чыг. майстэрні. Суднарамонтныя і суднабуд. верфі.

КАРАШКОЎ Міхаіл Іванавіч [н. 14(27).9. 1913, в. Аннаўка Скопінскага пав. Разанскай губ.], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Мінскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1940. З 1930 слесар Маск. трэста сантэхмантаж. У 1935—39 у Чырв. Арміі. З чэрв. 1941 на фронце, камандзір роты. У партызанах з лютага 1942 — камандзір узвода, з кастр. 1943 камандзір *партызанскай брыгады імя С. М. Кірава* Мінскай вобл. Пасля вайны на сав. і гасп. рабоце. Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі. Жыве ў Мінску.

КАРАЯН (Karajan) Герберт фон (н. 5.4.1908, Зальцбург), аўстрыйскі дырыжор. Дэбютаваў у 1927 (г. Ульм). З 1954 гал. дырыжор аркестра філармоніі Зах. Берліна. Быў таксама гал. дырыжорам сімф. аркестраў Венскай і Лонданскай філармоній, Венскай оперы, міланскага т-ра «Ла Скала». З 1967 наладжвае вясновы фестываль у Зальцбурзе, дзе ставіць оперы Р. Вагнера, манумент. творы кампазітараў-класікаў, выступае адначасова і як оперны рэжысёр. Адзін з найб. папулярных сучасных дырыжораў. Гастраляваў у СССР (1962, 1964, 1969).

КАРБАДА́Л, лякарства, тое, што *карбрамал*.

КАРБАМІ́Д, тое, што *мачавіна*.

КАРБАМІ́ДНЫЯ СМО́ЛЫ, высокамалекулярныя рэчывы, прадукты полікандэнсацыі альдэгідаў з амідамі многаасноўных кіслот. Пры тэрмаапрацоўцы К. с. пераходзяць у няплаўкі і нерастваральны стан. Выкарыстоўваюцца як аснова пры вырабе пластмас (гл. *Амінапласты*), клеяў для дрэваапр. прамысловасці, слаістых пластыкаў, лакаў высокай эл. трываласці і хім. устойлівасці, для прыгатавання асобатрывалай паперы, у ліцейнай справе.

Літ.: Хувинк Р. и Ставерман А. Химия и технология полимеров, т. 1—2, пер. с нем., М.— Л., 1965—66.

КАРБАНА́РЫІ (італьян. carbonaro літар. вугальшчык), члены тайнай рэвалюц. арганізацыі «Carboneria» у Італіі і Францыі 1-й пал. 19 ст.

Узніклі ў 1807 у Неапалітанскім каралеўстве пераважна з прадстаўнікоў дробнай буржуазіі, ліберальнага дваранства, афіцэрства. Т-вы К., т. зв. венты, былі ізаляваныя, спробы аб'яднаць іх дзеянні не мелі поспеху. Паліт. праграма К. невыразная. Сярод іх былі прыхільнікі рэспублікі, аднак у асноўным К. імкнуліся да ліберальна-канстытуцыйных пераўтварэнняў у межах асобных манархічных дзяржаў. Абяцаннем агр. рэформы імкнуліся залучыць на свой бок сялянства. Адна, баючыся стыхійных выступленняў нар. мас, асн. сродкамі барацьбы лічылі змовы і дзярж. перавароты. У 1813—15 вялі беспаспяховую ўзбр. барацьбу супраць напалеонаўскага рэжыму. Дзейнасць К. узмацнілася пасля рэстаўрацыі на Пд Італіі дынастыі Бурбонаў. Узначалілі бурж. рэвалюцыю ў Каралеўстве Абедзвюх Сіцылій (1820—21), Пемонце (1821), спрабавалі ўзняць паўстанне ў Папскай дзяржаве (1821). Пасля паражэння К. жорстка праследавалі ўлады. У 1831 удзельнічалі ў рэвалюц. выступленнях у Модэне, Балоньі, Парме. У 1815—30 дзейнічалі ў многіх краінах Еўропы. У Францыі К. ўдзельнічалі ў Чэрвеньскай рэвалюцыі 1830 і рэвалюц. руху пач. 30-х г.

Літ.: История Италии, т. 2, М., 1970.

КАРБАНА́ТЫ прыродныя, мінералы, вуглякіслыя солі металаў, пераважна двухвалентных Mg, Ca, Fe, Mn, Zn, Sr, Ba, Pb, Cu, таксама Na, радзей Co, Ni, Cd, U, рэдкіх зямель.

Падзяляюцца на простыя (*кальцыт* $CaCO_3$), двайныя (*даламіт* $CaMg[CO_3]_2$), складаныя (анкерыт $Ca(Mg, Fe)[CO_3]_2$), асноўныя (малахіт $CuCO_3 \cdot Cu(OH)_2$) і водныя солі (сода $Na_2CO_3 \cdot 10H_2O$). Крышталізуюцца ў трыганальнай і рамбічнай, часам у манаклінная і гексаганальнай сістэмах. Цв. 1,0—5,0; сярэдняя 3,0; шчыльн. 1420—7000 *кг/м³*. Большасць К. часткова раствараецца ў вадзе.

Найб. пашыраны кальцыт і даламіт, якія ўтвараюць вапнякі, даламіты, мел, мармуры; некаторыя К. эндагеннага паходжання (гл. *Карбанатыты*). Найважнейшыя перыяды карбанатаўтварэння на Беларусі — ардовікскі, сілурыйскі, дэвонскі і мелавы. К. выкарыстоўваюць у цэментавай, хім., металург., электратэхнічнай, лакафарбавай, шкляной, парфумернай, аптычнай прамысловасці, як буд. матэрыялы, угнаенні, вырабныя камяні.

Літ.: Бетехтин А. Г. Минералогия, М., 1950.

КАРБАНАТЫ́ТЫ, эндагенныя карбанатныя горныя пароды ў комплексах шчолачных па-

род. Падзяляюцца на кальцытавыя (сёвіты, альвікіты), даламітавыя (раўхагіты, бефарзіты), анкерытавыя, сідэрытавыя, содавыя (натрыевыя). Некаторыя даследчыкі лічаць К. прадуктамі крышталізацыі з магмы разам з сілікатнымі мінераламі, другія — метасаматычнымі гідратэрмальнымі ўтварэннямі.

Выяўлены сувязі К. з працяглымі зонамі стараж. глыбінных разломаў, часам — з алмазаноснымі кімберлітамі (ПАР). Пашыраны ў СССР (Кольска-Карэльская правінцыя, Сібірская платформа, Усх. Саяны, Цянь-Шань і інш.), Афрыцы, Канадзе, ЗША, Бразіліі, Зах. Еўропе (Скандынавіі, ФРГ), Індыі. К. змяшчаюць комплексныя радовішчы апатыту, медзі, флюарыту, танталу, ніобію, урану, рэдкіх зямель. Сыравіна для вогнетрывалых вырабаў, вытворчасці цэменту.

Літ.: Капустин Ю. Л. Минералогия карбонатитов, М., 1971; Карбонатиты, пер. с англ., М., 1969.

І. І. Ур'еў. Мінск.

КАРБАЦЫКЛІ́ЧНЫЯ ЗЛУЧЭ́ННІ (лац. carbo вугаль + грэч. kyklos кольца), арганічныя рэчывы, малекулы якіх маюць цыклы (кольцы), пабудаваныя з атамаў вугляроду.

Падзяляюцца на рады: аліцыклічны (аліфатычнага характару) і араматычны. Малекулы араматычных К. з. адрозніваюцца наяўнасцю плоскіх цыклаў, пераважна шасцічленных (гл. *Араматычныя вуглевадароды*). Аліцыклічныя бываюць насычаныя (цыклаалканы, цыклапарафіны, нафтэны) і ненасычаныя (цыклаалкены і цыклаалкіны). К. з. могуць мець розную колькасць атамаў вугляроду ў цыкле, розную колькасць і ўзаемнае размяшчэнне саміх цыклаў. Уваходзяць у састаў нафты, эфірных маслаў, бальзамаў. Да К. з. належаць *тэрпены, камфора, смаляныя кіслоты, караціны* і інш. Выкарыстоўваюцца ў вытворчасці палімерных матэрыялаў, фарбавальнікаў, лекавых прэпаратаў. Гл. таксама *Гетэрацыклічныя злучэнні*.

М. А. Маер. Мінск.

КАРБІ́ДЫ (лац. carbo вугаль), злучэнні металаў і некаторых неметалаў (крэмній, бор) з вугляродам. Цвёрдыя, тугаплаўкія рэчывы. К. бору B_4C і крэмнію SiC па цвёрдасці блізкія да алмазу. Большасць К. устойлівая да дзеяння агрэсіўных асяроддзяў (к-т, шчолачаў), аднак некаторыя (CaC_2, Al_4C_3 і інш.) раскладаюцца нават вадою. Выкарыстоўваюцца ў вытворчасці вогнетрывалых і каразійнаўстойлівых матэрыялаў і пакрыццяў, звышцвёрдых сплаваў, як абразіўныя матэрыялы, К. кальцыю CaC_2 — у вытворчасці ацэтылену.

КАРБОНАВЫЯ КІСЛО́ТЫ (лац. carbo вугаль), арганічныя злучэнні, у якія ўваходзіць карбаксільная група — COOH (карбаксіл). У залежнасці ад прыроды арган. радыкала, звязанага з карбаксілам, К. к. падзяляюцца на аліфатычныя, ці тлустыя (напр., воцатная к-та), араматычныя (напр., бензойная, фталевая к-ты) і гетэрацыклічныя (напр., нікацінавая к-та).

К. к. ў большасці слабыя. Пашыраны ў прыродзе ў свабодным выглядзе і як разнастайныя вытворныя: солі, ангідрыды, складаныя эфіры і г. д. Напр., складаныя эфіры вышэйшых тлустых К. к. з гліцэрынай — аснова прыродных тлушчаў. К. к., у якія ўваходзіць амінагрупа NH_2 (амінакіслоты),— аснова бялкоў. Атрымліваюць К. к. амыленнем тлушчаў і сінтэтычна. Ужываюцца ў арган. сінтэзе для атрымання палімерных матэрыялаў, духмяных, лекавых рэчываў і інш.

Літ.: Маньковская Н. К. Синтетические жирные кислоты. Получение, свойства, применение, М., 1965.

М. А. Маер. Мінск.

КАРБРАМА́Л (адалін, карбадал, урадал), заспакаяльны сродак і лякарства на сон. Атрымліваюць сінтэтычна. Выпускаюць у парашках і ў таблетках. Назначаюць пры парушэннях сну і хваробах нерв. сістэмы (неўрастэнія, істэрыя і інш.). Процiпаказаны пры павышанай адчувальнасці да брому.

КАРБУНКУЛ (лац. carbunculus вугалёк; старажытная рус. назва вуглявік, скула), вострае дыфузнае гнойна-некратычнае запаленне глыбокіх слаёў скуры і падскурнай клятчаткі вакол групы валасяных мяшочкаў і тлушчавых залоз. Узбуджальнік — гнаяродныя бактэрыі. Найчасцей бывае на патыліцы, паясніцы, твары.

Паяўленню К. спрыяюць знясіленне арганізма, парушэнне абмену рэчываў (цукровы дыябет), вітамінная недастатковасць. Прыкметы: цяжкі агульны стан (азноб, т-ра да 40 °С), шырокае амярцвенне тканак. Ускладненні (асабліва пры К. твару) — сепсіс, тромбафлебіт. Лячэнне: антыбіётыкі, сульфаніламіды, процізапаленчыя, антыгістамінныя, болепатольныя, агульнаўмацавальныя сродкі, вітаміны, новакаінавая блакада, аперацыя. Прафілактыка: гігіена скуры.

Літ.: Стручков В. И. Гнойная хирургия, 2 изд., М., 1967; Павлов С. Т. Кожные и венерические болезни, 2 изд., Л., 1969.

Ю. Ф. Каралёў. Мінск.

КА́РБЫШАЎ Дзмітрый Міхайлавіч [14(26). 10.1880, Омск — 18.2.1945], савецкі ваенны інжынер, ген.-лейтэнант інж. войск (1940). Д-р ваен. н., праф. Герой Сав. Саюза (1946). З сям'і вайскоўца. Чл. КПСС з 1940. Скончыў Мікалаеўскую інж. акадэмію (1911). Удзельнік рус.-яп. і 1-й сусв. войнаў. У 1911—14 рэканструяваў Брэсцкую крэпасць. З снеж. 1917 атрадны інж. Чырв. гвардыі ў Магілёве-Падольскім. З 1918 на буд-ве абарончых умацаванняў; удзельнік арг-цыі інж. забеспячэння аперацый па разгроме Калчака, Урангеля. З 1923 старшыня Інж. к-та Гал. ваен.-інж. ўпраўлення, старшыня Ваен.-тэхн. к-та; на навук.-пед. рабоце ў Ваен. акадэміі імя Фрунзе, у Акадэміі Ген. штаба. У пач. Айч. вайны ў р-не Гродна; пры выхадзе з акружэння паранены, каля Магілёва трапіў у палон. Фашысты прымушалі К. здрадзіць Радзіме. У лагерах смерці (Замосце, Флосенбург, Майданак, Асвенцім і інш.) вёў агітацыю сярод ваеннапалонных, удзельнічаў у стварэнні падпольных антыфаш. груп. 18.2.1945 у канцлагеры Маўтгаўзен фашысты вывелі К. на мароз і аблівалі вадой, пакуль не памёр. Аўтар навук. прац па ваен.-інж. справе і ваен. гісторыі. У 1963 на месцы смерці К. пастаўлены помнік (скульптар У. Я. Цыгаль). Яго імем названы вуліцы і школы ў Гродне і інш. гарадах СССР.



Тв.: Избранные научные труды, М., 1962.

Літ.: Солдат, герой, ученый, М., 1961; Голубов С. Когда крепости не сдаются, М., 1970.

В. І. Верамейчык. Мінск.

КАРБЮЗЬЕ, гл. *Ле Карбюзье.*

КАРВАЛАН (Corvalán) Луіс (н. 14.9.1916, Пуэрта-Монт), дзеяч чылійскага і міжнар. рабочага і камуніст. руху. З сям'і настаўніка. Па прафесіі настаўнік. Чл. кампартыі Чылі (КПЧ) з 1932. Актыўна супрацоўнічаў у парт. друку, быў на кіруючых парт. пасадах. З 1946 дырэктар цэнтр. органа КПЧ газ. «El Siglo» («Стагоддзе»). З 1948 у апараце ЦК КПЧ, з 1952 чл. ЦК, з 1956 сакратар ЦК па пытаннях прапаганды. З сак. 1958 ген. сакратар КПЧ. З 1961 сенатар Нац. канграсу Чылі. За рэвалюц. дзейнасць няраз арыштоўваўся і знявольваўся. Узначальваў дэлегацыі КПЧ на XX—XXIV з'ездах КПСС. Удзельнічаў у маскоўскай Нарадзе камуніст. і рабочых партый 1969.



КАРВАЛОЛ, заспакаяльнае і спазмалітычнае лякарства, аналаг *валакардзіну.*

КАРВАТОН, лякарства, тое, што *кардыямін.*

КАРВЕЛІ, вёска ў Варнянскім с/с Астравецкага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса «Перамога». За 19 *км* на Пн ад Астраўца, 269 *км* ад Гродна, 23 *км* ад чыг. ст. Гудагай, каля аўтамаб. дарогі г. п. Мядзел — Вільнюс (3 *км*). 162 ж., гасп. 53 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін.

КАРГІН Аляксей Георгіевіч (н. 23.2.1924, с. Налітава Корсунскага пав. Сімбірскай губ.), Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1944. Скончыў Беларускую с.-г. акадэмію (1968). Удзельнік Айч. вайны. У 1948—70 на парт. рабоце: заг. аддзела Уваравіцкага РК КПБ, першы сакратар Гомельскага РК КПБ, сакратар Гомельскага абкома КПБ. З 1970 гал. дзярж. інспектар па закупках і якасці с.-г. прадуктаў па Гомельскай вобл. На XXV—XXVII з'ездах КПБ выбіраўся чл. ЦК. Узнаг. ордэнам Леніна, 6 інш. ордэнамі, медалямі.

КАРГІН Валянцін Аляксеевіч [10(23).1. 1907, Днепрапятроўск — 21.10.1969], савецкі фізіка-хімік. Акад. АН СССР (1953, чл.-кар. 1946). Герой Сац. Працы (1966). Скончыў Маск. ун-т (1930). З 1937 заг. лабараторыі высокамалекулярных злучэнняў, лабараторыі калоіднай хіміі Фізіка-хім. ін-та імя Л. Я. Карпава. Адначасова: у 1956—59 заг. арганізаванай ім кафедры высокамалекулярных злучэнняў Маск. ун-та, старшы навук. супрацоўнік Ін-та нафтахім. сінтэзу АН СССР (з 1959). Асн. працы па фіз. хіміі ліяфобных калоідных сістэм, аналітычнай хіміі, электрахіміі і фізіка-хіміі высокамалекулярных злучэнняў. Дзярж. прэміі СССР 1943, 1947, 1950, Ленінская прэмія 1962. Узнаг. 3 ордэнамі Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі.



Тв.: (Разам з П. А. Гембіцкім і Д. С. Жукам) Химия этиленимина, М., 1966; (разам з Р. Л. Слонімскім) Краткие очерки по физико-химии полимеров, 2 изд., М., 1967.

Літ.: Валентин Алексеевич Каргин. М., 1969 (Материалы к биобиблиографии ученых СССР).

КАРДАМОН (Elettaria cardamomum), шматгадовая травяністая расліна сям. імбірных. Радзіма Індыя. Культывуецца ў трапічных краінах. На Беларусі К. вырошчваецца ў аранжарэях. Ужываецца як прыпраўная і лекавая расліна. З насення атрымліваюць эфірны алей.



Сцябло выш. да 1 *м*. Лісце ланцэтна-эліптычнае, скурастае, моцна пахне. Кветкі жоўтыя ў коласападобных суквецціх. Плод — каробачка.

КАРДА́НА ФО́РМУЛА, формула для знаходжання каранёў няпоўнага *кубічнага ўраўнення*: $x^3+px+q=0$.

К. ф. запісваецца: $x=\sqrt[3]{-\frac{q}{2}+\sqrt{\frac{q^2}{4}+\frac{p^3}{27}}}+\sqrt[3]{-\frac{q}{2}-\sqrt{\frac{q^2}{4}+\frac{p^3}{27}}}$. Атрымана (1545) італьян. вучоным Дж. Карданам (1501—76).

Калі каэфіцыенты p, q — сапраўдныя лікі, то характар каранёў кубічнага ўраўн. залежыць ад знака выразу $\Delta=\frac{q^2}{4}+\frac{p^3}{27}$: 1) $\Delta>0$ — тры карані ўраўн. розныя (адзін сапраўдны, два іншыя — спалучаныя комплексныя); 2) $\Delta=0$ — карані сапраўдныя (два з іх роўныя); 3) $\Delta<0$ — карані сапраўдныя і розныя.

КАРДАНА́ЖНАЯ ВЫТВО́РЧАСЦЬ, выраб скрынак, каробак, пакетаў і інш. упаковак з кардону і паперы. Упакоўка бывае мяккая, паўцвёрдая, цвёрдая, камбінаваная, вонкавая тара (скрынкі).

Мяккую ўпакоўку (пакеты, мяшочкі, канверты, мяшкі і інш.) робяць з моцнай паперы на аўтам. абсталяванні, якое выконвае за адзін прагон папіровага палатна ўсе тэхнал. аперацыі: друк, фальцоўку, склейку, фармаванне і г. д. Да цвёрдай упакоўкі належаць складныя пачкі і каробкі, якія робяць з кардону; вырабляюць іх на аўтам. прэсах ці на т. зв. аблатачных машынах, а таксама на друкавальна-прасякальных аўтаматах. Цвёрдая упакоўка (кардонныя каробкі клеевыя, сшыўныя, аборныя штампаваныя) робіцца на спецыялізаваных аўтаматах. Камбінаваныя каробкі робяць з бляшаных донцаў і накрывак і папіровага корпуса, скрынкі — з гафраванага і суцэльнага кардону. На Беларусі Добрушскі цэлюлозна-папяровы камбінат «Герой працы» і ф-ка «Чырвоная зорка» (г. Чашнікі Віцебскай вобл.) вырабляюць папяровыя мяшочкі, Светлагорскі цэлюлозна-кардонны камбінат — скрынкі з гафраванага кардону, кардонная ф-ка «Беларусь» (г. Слонім Гродзенскай вобл.) — каробкі для абутку.

Літ.: Крыльцова Г. Г. Картонажное производство, М., 1960; Томашевский В. Л. Технология картонажного производства, М., 1953.

КАРДО́ВІЧ Іосіф Мітрафанавіч [24.3(5.4). 1899, в. Друцк Магілёўскага пав.— 27.12.1967], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну, дзярж. дзеяч БССР. Ген.-м. (1943). З сялян. Чл. КПСС з 1928. Прац. дзейнасць пачаў парабкам. У 1919—22 у Чырв. Арміі. З 1925 на сав. рабоце ў Талачынскім, Дубровенскім, Лельчыцкім, Мсціслаўскім, Горацкім р-нах. З 1939 нам. старшыні Магілёўскага аблвыканкома. У ліп. 1941 удзельнічаў у абароне Магілёва, чл. абласнога штаба пар. апалчэння. У 1942 накіраваны ЦК КП(б)Б у Магілёўскую вобл. для кіраўніцтва партыз. рухам; з жн. сакратар падпольнага Бабруйскага міжраённага к-та КП(б)Б; з кастр. ўпаўнаважаны ЦК КП(б)Б па Магілёўскай вобл. З крас. 1943 чл. Магілёўскага падпольнага абкома КП(б)Б. У 1943—53 старшыня Магілёўскага, Віцебскага аблвыканкомаў. З 1953 член калегіі Мін-ва харч. тавараў, нам. міністра прамысловасці мясных і малочных прадуктаў БССР, у Белкаапсаюзе. На XIX з'ездзе КПБ выбраны канд. у чл. ЦК, на XX — чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета СССР 2—3-га скл.; Вярх. Савета БССР 3-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, 3 інш. ордэнамі, медалямі.



Э. Ф. Языковіч. Мінск.

КАРДО́Н (італьян. cartone), 1) цвёрдая і тоўстая папера, маса квадратнага метра якой больш за 250 *г*.

У залежнасці ад прызначэння і фіз.-мех. уласцівасцей К. бывае тарны (для вырабу скрынак і каробак, гл. *Кардонажная вытворчасць*), паліграфічны (пераплётны, матрычны, прэсшпан, білетны і інш.), абутковы (для вырабу вусцілак, задніка), будаўнічы (абліцовачны, сценавы), электраізаляцыйны і інш. тэхнічны. На Беларусі К. вырабляюць кардонныя ф-кі «Беларусь» (г. Слонім Гродзенскай вобл.), «Альхоўка» (Астравецкі раён Гродзенскай вобл.), «Раёўка» (Маладзечанскі раён Мінскай вобл.), Пухавіцкая фабрыка (пас. Светлы Бор Пухавіцкага раёна Мінскай вобл.).

2) У мастацтве — дапаможны малюнак (часта расфарбаваны), які дакладна ўзнаўляе задуманую кампазіцыю ці яе дэталь. Выконваецца звычайна на К. ў маштабе будучага твора (фрэскі, мазаікі, вітража, шпалеры).

Літ.: Даровский Б. С. Производство картона, М.— Л., 1956; Леман Г. Основы технологии переработки бумаги и картона, пер. с нем., М., 1968.

КАРДО́Н, вёска ў Мікалаеўскім с/с Шумілінскага р-на Віцебскай вобл., на правым беразе Зах. Дзвіны. Цэнтр калгаса «Дзвіна». За 31 *км* на ПдЗ ад Шуміліна, 70 *км* ад Віцебска, 20 *км* ад чыг. ст. Лоўжа. 156 ж., двароў 41 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі, магазін. Помнік на брацкай магіле 151 сав. воіна і партызана, сярод якіх Герой Сав. Саюза Л. Л. Вінер, абеліск 160 воінам-землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

КАРДО́ЎСКІ Дамітрый Мікалаевіч [24.8(5.9). 1866, в. Асурава Пераслаўскага пав. Уладзімірскай губ.— 10.2.1943], рускі савецкі графік і тэатр. мастак. Засл. дз. маст. РСФСР (1929). Праф. (1907), акад. АМ (1911). Вучыўся ў Пецярбургскай АМ (1892—1902) у П. Чысцякова і І. Рэпіна, у А. Ажбе ў Мюнхене (1896—1900). За сатыр. рысункі ў час. «Жупел» і «Адская почта» (1905—06) быў узяты пад нагляд паліцыі. Лепшыя ілюстрацыі (1903—32): да апавядання А. Чэхава «Каштанка», аповесці М. Гогаля «Неўскі праспект», камедыі А. Грыбаедава «Гора ад розуму», паэмы М. Някрасава «Рускія жанчыны», рамана А. Талстога «Пётр I». Сярод тэатр. работ — эскізы дэкарацый і касцюмаў да спектакляў Малога т-ра: «Лес» (1921), «Беднасць не загана» (1924), «Свае людзі — паладзім» (1929) А. Астроўскага, «Нахлебнік», «Снеданне ў прадвадзіцеля» (абодва ў 1924) І. Тургенева, «Рэвізор» М. Гогаля (1922). Сярод вучняў К.— В. Яфанаў, Дз. Шмарынаў.

Літ.: Подобедова О., Д. Н. Кардовский, М., 1957.

КАРДО́ЎСКІ ХАЛІФА́Т, феадальная дзяржава на Пірэнейскім п-ве (929—1031).

Засн. Абдарахманам III (929—961), які значна расшырыў і ўмацаваў тэр. *Кардоўскага эмірата* і абвясціў сябе халіфам. Цэнтралізаваная дэспатыя. Аснова эканомікі К. х.— буйное землеўладанне. Найб. ўздыму дасягнуў у 2-й пал. 10 ст. (росквіт с. гасп., адабыча металаў, развіццё рамёстваў, суднабудавання). Павялічылася колькасць гарадоў, усталяваўся гандаль з краінамі Еўропы і Паўн. Афрыкі. Меў моцную армію і флот, атрымаў шэраг перамог над хрысціянскімі дзяржавамі Паўн. часткі п-ва. Вялося значнае будаўніцтва ў сталіцы халіфата Кордаве. Моцная феадалізацыя, міжусобныя войны аслабілі К. х., і ён распаўся на шэраг дробных эмірататаў.

Літ.: Кудрявцев А. Е. Испания в средние века, Л., 1937.

КАРДО́ЎСКІ ЭМІРА́Т, феад. сярэдневяковая дзяржава на Пірэнейскім п-ве (756—929).

Засн. Абдарахманам I (756—788) з дынастыі Амеядаў у выніку завалявання арабамі і берберамі большай часткі п-ва. Вёў пастаянныя войны з хрысціянскімі дзяржавамі на Пн п-ва. Пры Абдарахмане III, які абвясціў сябе халіфам (929), пачалася гісторыя *Кардоўскага халіфата.*

КАРДУ́ЧЫ (Carducci) Джозуэ (27.7.1835, Валь-ды-Кастэла Пізанскай правінцыі — 16.2. 1907), італьянскі паэт. Сын урача-карбанарыя. З 1860 выкладчык італьян. л-ры ў Балонскім ун-це. У 60-я г. рэспубліканец. Уваходзіў (70-я г.) у італьян. секцыю 1-га Інтэрнацыянала. Пазней змірыўся з бурж. манархіяй. Друкаваўся з 1850. Асн. тэматыка паэзіі К.— вызв. барацьба італьян. народа, услаўленне яе герояў («Джузэпе Гарыбальдзі», «Пасля Аспрамонтэ» і інш.). Антыкаталіцкія і антырэліг. матывы ў паэме «Да Сатаны» (нап. 1863, апубл. 1865) і інш. Пісаў пра падманны патрыятызм вярхоў, здраду буржуазіі, якая скарыстала здабыткі нар. барацьбы. У пазнейшай творчасці (зб. «Варварскія оды» і інш.) рэвалюц., грамадзянскі пафас намнога слабейшы. Аўтар зб. «Лёгкае і сур'ёзнае» (нап. 1861—67), «Ямбы і эподы» (нап. 1867—79). Вядомы і як даследчык эпох позняга сярэдневякоўя і Адраджэння (арт. пра Дантэ, Ф. Петрарку, Дж. Бакачыо і інш.). Нобелеўская прэмія 1906.

Тв.: Рус. пер.— Избранное, М., 1958; Избранные стихи, М., 1950.

КАРДЫЕРЫТ (ад імя франц. геолага Л. Кардзье), і я л і т, мінерал класа сілікатаў $Al_3(Mg, Fe)_2[AlSi_3O_{18}]$. Празрыстыя разнавіднасці выкарыстоўваюць як каштоўныя камяні.

Крышталізуецца ў рамбічнай сістэме. Звычайна трапляецца ў суцэльных масах ці ў зернях. Колер сінявата-шэры, фіялетавы, буры, часам бясколерны. Цв. 7,0—7,5; шчыльн. 2600—2660 *кг/м*³. Паходжанне метамарфічнае. Радовішчы ў СССР, на Цэйлоне, у Фінляндыі, Нарвегіі.

КАРДЫЕІДА (ад грэч. kardia сэрца+eidos выгляд), прыватны выпадак эпіцыклоіды. Гл. *Гіпацыклоіды і эпіцыклоіды.*

КАРДЫЛЬЕРЫ (Cordilleras), самая доўгая горная сістэма Зямлі. Займае зах. ўскраіну Паўн. і Паўд. Амерыкі. Даўж. больш за 18 000 *км*, шыр. да 1600 *км*. Размешчана на тэр. Канады, ЗША, краін Цэнтр. і Паўд. Амерыкі. Найвыш. вяршыні Аканкагуа (6960 *м*), Мак-Кінлі (6193 *м*). Амаль на ўсім працягу — водападзел паміж Ціхім і Атлантычным акіянамі. Кліматычны бар'ер паміж раёнамі, размешчанымі па абодвух баках сістэмы. Падзяляецца на *Кардыльеры Паўночнай Амерыкі* і Кардыльеры Паўд. Амерыкі, або *Анды*.

КАРДЫЛЬЕРЫ ПАЎНОЧНАЙ АМЕРЫКІ, горная сістэма на З Паўн. Амерыкі. Цягнецца ад Аляскі да Панамскага перашыйка на 6000 *км*. Найб. шыр. каля 1600 *км*. Найвыш. пункт г. Мак-Кінлі, выш. 6193 *м* (Аляскінскі хр.). У рэльефе К.П.А. з У на З выдзяляюць 5 зон. Усх. зону ўтвараюць хр. Брукс (2816 *м*), горы Макензі, Скалістыя горы (4399 *м*) і Усх. Сьера-Мадрэ (да 4054 *м*). На З горы пераходзяць ва ўнутраныя пласкагор'і і плато на выш. 1000—2000 *м*: Юкан, Унутранае плато, Калумбійскае, Вялікі Басейн, Каларада, Мексіканскае нагор'е (унутр. частка). Невадыйская зона пачынаецца на Алеуцкіх а-вах, пераходзіць у Алеуцкі хр. (2507 *м*) на п-ве Аляска, потым у Аляскінскі хрыбет (6193 *м*), горы Св. Ільі (6050 *м*), Берагавы хр. (4042 *м*), Каскадныя горы (4317 *м*), Сьера-Невада, Зах. Сьера-Мадрэ і Вулканічная Сьера з вулканамі Арысаба

Скалістыя горы ў штаце Юта (ЗША).





(5700 *м*) і Папакатэпетль (5452 *м*), апошні дзейны. Ад Зах. зоны Невадыйская аддзелена глыбокім міжгорным прагінам, занятым марскімі пралівамі (Канада), Уіламецкай і Каліфарнійскай далінамі (ЗША) і Каліфарнійскім залівам (Мексіка). Зах. горная зона цягнецца ўздоўж берага Ціхага ак., утварае на некат. участках астраўныя ланцугі. На Пд ад перашыйка Тэўантэпек хрыбты пераважна невысокія, адасобленыя. У канцы палеазою на месцы К.П.А. адбываліся працэсы складкавасці і гораўтварэння. У юрскім і мелавым перыядах мезазою пачалося актыўнае гораўтварэнне ў Цэнтр. зоне (невадыйская складкавасць) і на У сістэмы (ларамійская складкавасць). У кайназоі ўтварылася зах. частка К. П. А. Значную ролю ў фарміраванні рэльефу адыграла чацвярцічнае абледзяненне (асабліва на Пн ад 40° паўн. ш.). Зах. ўскраіна К. П. А.— зона сучаснага вулканізму і землетрасенняў. Карысныя выкапні: руды каляровых і рэдкіх металаў, вугаль, нафта, уран, ртуць, волата, плаціна, алмазы.

Клімат разнастайны: арктычны і субарктычны на Пн Аляскі, паміж Аляскай і 40° паўн. ш.— умераны, на Пн Мексікі субтрапічны і трапічны, на Пд субэкватарыяльны, на схілах гор каля Ціхаакіянскага ўзбярэжжа пераважна мяккі, акіянічны; ва ўнутр. і усх. частках К. П. А. кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. —30, ліп. 15 (плато Юкан), студз. 15, ліп. 24 °С (Пд Каліфорніі). На Панамскім перашыйку сярэднемесячныя т-ры ў межах 25—28 °С. Ападкаў на зах. ўзбярэжжы Канады 6000 *мм*, на ўнутр. плато ЗША 200—400 *мм*, у пустыні Махаве 50 *мм*, на ПдУ Мексіканскага нагор'я да 2000 *мм* за год. Снегавая лінія на Пн (Аляска) на выш. 400—500 *м*, на Пд Скалістых гор на выш. 3500—4000 *м*. Многа ледавікоў. К. П. А.— водападзел паміж Паўн. Ледавітым, Ціхім і Атлантычным акіянамі. Рэкі, якія пачынаюцца ў гарах, адносяцца да бас. Паўн. Ледавітага (сістэма р. Макензі), Ціхага (Юкан, Фрэйзер, Каламбія, Каларада і інш.) і Атлантычнага (Місуры, рэкі бас. Місісіпі — Місуры, Рыо-Грандэ) акіянаў. Большасць рэк мае снегавое жыўленне. Глебы і расліннасць разнастайныя. Хр. Брукс і часткова хр. Макензі знаходзяцца ў зоне тундры. На Пн ад 53° паўн. ш. на ўнутр. пласкагор'ях пануе таежная расліннасць на падзолістых глебах. Далей на Пд лесастэп на шэрых лясных глебах. Сухалюбныя віды дрэў (хвоя жоўтая і хвоя скручаная) замяняюць энгельманаву елку, альпійскую піхту. На Калумбійскім плато стэпы і паўпустыні на чарназёмападобных і каштанавых глебах. На Пн Вял. Басейна паўпустыні на бурых і шэрых глебах; на Пд пашыраны сукуленты (кактусы выш. да 9 *м*, агавы, юкі). На Пд Мексіканскага нагор'я высакатраўная саванна на шэра-карычневых, карычневых і чырвоных глебах. На вонкавых схілах, якія акаймоўваюць нагор'е, экватарыяльныя лясы. Зах. схілы берагавых хрыбтоў, ад Аляскі да штата Каліфорнія, укрыты лясамі з дугласіі, сітхінскай елкі, піхты, гемлока. У Каліфорніі да іх далучаецца чырвонае дрэва, секвоя, жоўтая хвоя. На У К. П. А. хвойныя лясы пераважна на ўвільготненых схілах гор. Верхняя мяжа лесу праходзіць на Пд Аляскі на выш. 600—800 *м*, каля 49° паўн. ш.— 2000 *м*, на Пд Скалістых гор — 3000—3600 *м*. Вышэй — альпійскія лугі і горная тундра. Жывёльны свет: шэры і чорны мядзведзі, пума, амер. алень, снежная каза, рысь, воўк. На Пн расамаха і андатра. Птушкі: грыф, на Пд кондар і розныя віды калібры. На пласкагор'ях Пд паўзуны.

Літ.: Боли А. Северная Америка. М., 1948; Игнатьев Г. М. Северная Америка. М., 1965; Кордильеры Америки. Симпозиум, пер. с англ., М., 1967.

В. А. Жучкевіч. Мінск.

КАРДЫСКІ МІРНЫ ДАГАВОР 1661, дагавор паміж Расіяй і Швецыяй, які закончыў руска-шведскую вайну 1656—58. Заключаны 21 чэрв. (1 ліп.) у мяст. Кардысы каля Юр'ева (Тарту).

Шведскую дэлегацыю ўзначальваў Б. Горн, рускую — князь І. С. Прозаровскі. Расія пайшла на дагавор, бо не хапала сіл адначасова весці *рускапольскую вайну 1654—67* і ваяваць са Швецыяй. Паводле дагавору Расія вярнула Швецыі эстляндскія і ліфляндскія землі, якія належалі ёй па Валіесарскім дагаворы 1658; Швецыя абавязалася не памагаць Польшчы, не нападаць на «Малую і Белую Расію»; аднавіліся гандлёвыя адносіны. Пасля К. м. д. стала лягчэй Расіі ваяваць за Украіну і Беларусь. К. м. д. пацверджаны ў 1684.

Літ.: Бантыш-Каменский Н. Н. Обзор внешних сношений России (по 1800 год), ч. 4, М., 1902.

КАРДЫЯГРАФІЯ (грэч. kardia сэрца+ +*...графія*), метады графічнай рэгістрацыі сардэчнай дзейнасці.

Адрозніваюць К. электрычнай актыўнасці сэрца (электракардыяграфія), гукаў, якія суправаджаюць сардэчную дзейнасць (фонакардыяграфія), сардэчных скарачэнняў (рэакардыяграфія, полікардыяграфія) і інш. К. памагае ўдакладніць дыягназ хвароб. Робяць К. спец. электроннымі прыладамі — кардыёграфамі.

Літ.: Справочник по функциональной диагностике, М., 1970; Мазо Р. Э. Инструментальные методы исследования сердца в педиатрии, Мн., 1964.

КАРДЫЯМІН (анакардон, карватон, танакард), 25% раствор дыэтыламіду нікацінавай к-ты, лякарства, якое стымулюе дыханне, сардэчна-сасудзістую і цэнтр. нерв. сістэмы. Назначаюць унутр (кроплі) або падскурна (раствор) пры расстройствах сардэчнай дзейнасці і дыхання (асфіксія, шок, калапс, атручэнні).

КАРДЫЯСКЛЕРОЗ (грэч. kardia сэрца+ +sklēros цвёрды), м і я к а р д ы я с к л е р о з, хвароба ад развіцця злучальнай (рубцовай) тканкі ў мышцы сэрца. Найчасцей бывае як вынік парушэння сардэчнага (каранарнага) кровазвароту (атэрасклератычны К.), запалення сардэчнай мышцы (міякардыясклератычны К.). Прыкметы: боль у вобласці сэрца, *стэнакардыя*, парушэнне рытму, сардэчная недастатковасць. Лячэнне: сродкі для паляпшэння кровазвароту і абмену рэчываў. Прафілактыка: ліквідацыя асн. хваробы, лячэбная фізкультура, дыэта.

Літ.: Справочник по функциональной диагностике, М., 1970; Мясников А. Л. Гипертоническая болезнь и атеросклероз, М., 1965; Йонаш В. Частная кардиология, ч. 2, пер. с чешск., Прага, 1963.

І. С. Гулько. Мінск.

КАРДЭНАС-І-ДЭЛЬ-РЫО (Cárdenas y del Rio) Ласара (21.5.1895, штат Мічаакан — 19. 10.1970), дзярж., ваен. і паліт. дзеяч Мексікі. З сям'і ткача-саматужніка. Удзельнічаў у бурж.-дэмакр. рэвалюцыі 1910—17. У 1928 атрымаў чын дывізійнага генерала. Быў губернатарам штата, міністрам унутр. спраў, ваен. міністрам. У 1934—40 прэзідэнт Мексікі. Яго ўрад нацыяналізаваў уласнасць амер. і англагаландскіх нафтавых кампаній, чыгункі, якія належалі англа-амер. трэстам, ажыццяўляў агр. рэформу. Пасля 2-й сусв. вайны актыўна ўдзельнічаў у Руху прыхільнікаў міру. У 1950 выбраны віцэ-старшынёй Сусв. Савета Міру. Міжнар. Ленінская прэмія «За ўмацаванне міру паміж народамі» за 1955.

КАР'ЕР (ад франц. carrière каменаломня, бег), 1) сукупнасць горных вырабак, абсталяваных для здабычы карысных выкапняў ад-

крытым спосабам (гл. *Адкрытыя горныя работы*). Вугальныя К. наз. таксама разрэзамі; невялікія К. для здабычы буд. каменю — каменаломнямі. 2) Бег каня з найб. скорасцю в пачарговай перастаноўкаю разам пярэдніх і задніх ног.

КАРЖАНЕЎСКІ Іосіф [н. 19(31).3.1806, Слуцкі пав. Мінскай губ.— 1870], беларускі вучоны ў галіне хірургіі і інфекцыйных хвароб. Д-р медыцыны (1829), праф. (1837). У 1827 скончыў мед. ф-т Віленскага ун-та (з 1832 Медыка-хірург. акадэмія) і там працаваў. Займаўся практ. дзейнасцю па хірургіі ў Вільні з 1842. Асн. навук. працы па пытаннях сыпнога тыфу, лячэнні пераломаў, артапедыі, дэсмургіі.

Тв.: De ossibus fractis tractatus in discentium usum, Vilnae, 1837.

Літ.: Bieliński J. Doctorowie medycyny, promowani w Wilnie, Warszawa, 1886.

КАРЖОЎ Даніла Трафімавіч (1902, с. Мікалаеўка Валчанскага пав. Харкаўскай губ.— 1943), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Канд. у чл. КПСС з 1943. На фронце з 1942. Вызначыўся на тэр. Камарынскага р-на Палескай вобл. 28.9.1943 пад агнём праціўніка фарсіраваў Дняпро і агнём з ручнога кулямёта рассеяў групы гітлераўцаў, якія перашкаджалі пераправе сав. войск. Прапаў без вестак у ліст. 1943.

КАРЗЯНКОВА Аляўціна Аляксандраўна (н. 25.3.1935, Ленінград), беларуская савецкая артыстка балета. Нар. арт. БССР (1964). Пасля заканчэння ў 1954 Ленінградскага харэагр. вучылішча салістка Бел. т-ра оперы і балета. Сярод партый: Марыя і Наталька («Мара» і «Выбранніца» Я. Глебава), Дзяўчына («Пасля балю» Г. Вагнера), Золушка («Золушка» С. Пракоф'ева), Сары («Сцежкаю грому» К. Караева), Эгіна і Фрыгія («Спартак» А. Хачатурана), Адэта-Адылія («Лебядзінае возера» П. Чайкоўскага), Нікія, Кітры і Вулічная танцоўшчыца («Баядэрка» і «Дон Кіхот» Л. Мінкуса), Францыска («Блакітны Дунай» на музыку І. Штраўса). К. уласцівы ўменне вылявіць сутнасць вобраза, драм. насычанасць і ў той жа час стрыманасць акцёрскай ігры, высокая тэхніка танца.



А. А. Карзянкова ў ролі Францыскі.

Літ.: Модэль М. Чароўная песня сэрца, «Беларусь», 1963, № 1; Яго ж. Танцуе Карзянкова, там жа, 1965, № 11. Ю. М. Чурко. Минск.

КАРКАС у тэхніцы (італьян. carcassa), касцяк будынка, збудавання, апарата, прыладу, які забяспечвае іх трываласць, устойлівасць і жорсткасць (напр., К. лятальнага апарата, карабля). Каркасамі мацуюцца гнуткія матэрыялы (тканіны, лісты фанеры).

Арматурныя К. жалезабетонных канструкцый робяць з стальных стрыжняў ці з дроту ў выглядзе прасторавых канструкцый. Жорсткасць вузлоў арматурных К. дасягаецца зваркай стальных закладных частак ці бетанаваннем пускаў арматуры, звараных паміж сабою. Вызначэнне К. ў спалучэнні з лёгкімі агараджальнымі канструкцыямі сцен і перагародак дае магчымасць знізіць вагу збудавання. На будынкі з К. патрэбна менш жалезабетону, але большы расход сталі. Гл. таксама *Каркасныя канструкцыі*.

КАРКАСНЫЯ КАНСТРУКЦЫІ (у будаўніцтве), нясучыя канструкцыі, асновай якіх з'яўляецца каркас з жалезабетону, сталі ці з драўляных матэрыялаў.

К. к. успрымаюць асн. нагрузкі, перадаюць іх праз фундамент на грунт, забяспечваюць жорсткасць збудавання. У каркасна-панельных жылых і прамысл. будынках на каркасе мацуюцца агараджальныя канструкцыі — сценавыя панелі. У с.-г. і складскіх збудаваннях прамежкі паміж калонамі запаўняюцца цэглай, лёгкім бетонам і інш. Гл. таксама *Жалезабетон, Драўляныя канструкцыі*.

КАРКЛІН Марцін Марцінавіч [1(13).2.1894, Баўскі пав. Курляндскай губ.— 7.1.1946], дзяржаўны дзеяч БССР. З рабочых. Чл. КПСС з люг. 1917. Працаваў рабочым на з-дах. Удзельнік Кастр. рэвалюцыі ў Ніжнім Ноўгарадзе. З 1918 нам. старшыні выканкомаў Ніжагародскай і Самарскай губ., старшыня выканкома Церскай губ. З 1925 нам. старшыні СНК БССР і адначасова старшыня камісіі заканадаўчых меркаванняў пры СНК БССР (1926—27), старшыня Дзярж. планавай камісіі (з люг. 1927), старшыня Эканам. нарады пры СНК БССР (з 1927). З студз. 1930 у РСФСР: нам. старшыні праўлення Дзярж. банка СССР, нам. старшыні ВСНГ РСФСР, нам. наркома лёгкай прамысловасці СССР, старшыня ЦК Саюза работнікаў гасп. устаноў СССР. На IX—XII з'ездах КП(б)Б выбраны чл. ЦК, чл. Бюро ЦК КП(б)Б з 1925 да 8.1.1930. Чл. ЦВК СССР (1922—37). Чл. ЦВК БССР 8—9-га скл. (1927—30), чл. Прэзідыума ЦВК БССР (1928—30). *У. У. Грамовіч.* Мінск.

КАРЛ IV, Карэл I Чэшскі (Karl IV, Carel I; 14.5.1316—29.11.1378), чэшскі кароль з 1346, германскі кароль і імператар «Свяшчэннай Рымскай імперыі» [1347—78]. З дынастыі *Люксембургаў*. Умацоўваў каралеўскую ўладу. Апіраўся на гандл.-рамесныя колы, сяродняю і дробную шляхту. Пры ім Чэхія стала гал. дзяржавай «Свяшчэннай Рымскай імперыі» (замацавана Залатой булай К. IV). Спрыяў развіццю рамёстваў, горнай справы, гандлю, буд-ва. Далучыў да ўладанняў Люксембургаў частку Верхняга Пфальца, землі ў Цюрынгіі і Саксоніі, Ніжнія Лужыцы, Бранденбург. Дынастычная унія ўмацавала сувязі з Венгрыяй і Польшчай. Росквіт Чэхіі пры Карле IV меў глыбокія сац. і нац. супярэчнасці, якія пазней выявіў *гусіцкі рэвалюцыйны рух*.

Літ.: Маркс К. Хронологические выписки, у кн.: Архив Маркса и Энгельса, т. 6, М., 1939, с. 75—91.

КАРЛ V (Karl V; 24.2.1500—21.9.1558), іспанскі кароль, прыц Нідэрландаў, кароль Сіцыліі з 1516, імператар «Свяшчэннай Рымскай імперыі» [1519—56]. У дзяржаву К. V уваходзілі тэр. сучаснай Германіі, Аўстрыі, Іспаніі, Паўд. Італіі, Сардзініі, Сіцыліі, ісп. Нідэрланды, ісп. калоніі ў Амерыцы. Рэалізоўваў авантурыст. праграму стварэння т. зв. «сусветнай хрысціянскай манархіі». Вёў шматлікія войны з Францыяй за панаванне ў Італіі і ў бургундскіх уладаннях (1521—44), у Турцыі адваляваў Туніс (1535). Да ісп. уладанняў у Амерыцы далучыў Мексіку (1519—21) і Перу (1532—36). Апіраючыся на феадалаў, праводзіў палітыку абсалютызму, што выклікала ў Іспаніі паўстанне камунерас (1520—22), у Нідэрландах Генцкае паўстанне (1539—40). Актыўны праціўнік *Рэфармацыі*. Вёў барацьбу супраць ням. пратэстанцкіх князёў, перамог у Шмалькальдэнскай вайне 1546—48, аднак у новай вайне 1552 быў пераможаны і заключыў Аўгсбургскі рэлігійны мір 1555 (гл. *Аўгсбургскае вызнанне*). Пасля гэтага адмовіўся ад улады ў Нідэрландах (1555), Іспаніі і ад імператарскага трону (1556).

КАРЛ XII [Karl XII; 17(27).6.1682—30.11(11.12).1718], шведскі кароль [1697—1718], палкаводзец. Трымаўся абсалютысцкай і вялікадзяржаўнай палітыкі. Удзельнічаў у *Паўночнай вайне 1700—21* супраць Паўн. саюза (Расія, Польшча, Данія). У жн. 1700 прымусіў капітуляваць Данію (Травендальскі мір 1700). У ліст. 1700 перамог рус. армію пад Нарвай. Разбіў польска-саксонскія войскі і пасля капітуляцыі Польшчы (1706) пасадзіў на польскі трон свайго стаўленіка Станіслава Ляшчынскага. У 1708 уварваўся ў Расію, аднак спроба захапіць Маскву яму не ўдалася. У вер. 1708 Пётр I нанёс магутны ўдар арміі К. XII каля Лясной, у *Палтаўскай бітве 1709* шведы былі канчаткова разгромлены. Уцёк у Турцыю, рыхтаваў новае наступленне на Расію. Пасля паражэння шведаў у Фінляндыі і каля Гангута (1714) пачаў мірныя перагаворы з рус. прадстаўнікамі. У 1716 абараняў Швецыю ад высадкі войск Паўн. саюза. Спрабаваў захапіць Нарвегію. Загінуў у час асады Фрэдэрыксхаля ў Зах. Нарвегіі.

Літ.: Тарле Е. Карл XII в 1708—1709 гг., «Вопросы истории», 1950, № 6.

КАРЛ ВЯЛІКІ (лац. Carolus Magnus, франц. Charlemagne; 2.4.742—28.1.814), франкскі кароль з 768, імператар [800—814]. Ад яго імя атрымала назву дынастыя Каралінгаў. Вёў завaёўніцкія войны супраць лангабардаў, саксаў, арабаў у Іспаніі, супраць аварaў, зах. славян і інш. У выніку заваёў дзяржава К. В. заняла тэр. сучаснай Францыі, Зах. і Паўд. Германіі, Бельгіі, Галандыі, Аўстрыі, часткі Італіі і Іспаніі. У часы праўлення К. В. адбыўся некаторы культ. ўздым, т. зв. «каралінгскае адраджэнне». Імперыя К. В. была штучным і нетрывалым ваен.-адм. аб'яднаннем, не мела агульнай эканам. базы. К. В. ажыццяўляў прымусовую хрысціянізацыю ў захопленых абласцях. Пры ім прадаўжаўся працэс фарміравання феад. адносін у Зах. Еўропе, узмацнялася буйное землеўладанне.

Літ.: Serejski M. H., Karol Wielki na tle swoich czasów, [Warszawa], 1959.

КАРЛАВЫ ВАРЫ (Karlovy Vary), бальнеалагічны курорт у ЧССР у даліне р. Цепла, 380 *м* над узр. м., за 120 *км* ад Прагі.

Лета негарачае, восень цёплая, зімa мяккая. Сярэднегадавая т-ра 7,6 °С. Асн. лекавыя фактары: 14 мінер.-тэрмальных (35—72 °С) гідракарбанатна-сульфатна-хларыдна-натрыевых крыніц (на піццё і ванны) і жалезістыя тарфяныя гразі. Лечаць хваробы печані, жоўцевых шляхоў, страўніка, кішак, парушэнне абмену рэчываў. Сезон увесь год.

Літ.: Борисов А. Д. Важнейшие курорты социалистических стран Европы, М., 1967.

КАРЛАЎКА, вёска ў Брагінскім р-не Гомельскай вобл. Падпарадкоўваецца Камарынскаму гарпасялковаму Савету. Цэнтр саўгаса «Камарынскі». За 58 *км* на Пд ад Брагіна, 188 *км* ад Гомеля, 12 *км* ад чыг. ст. Ельча. 397 ж., гасп. 126 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, магазін. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў Айч. вайны.

КАРЛІКАВАЕ ПЛАДАВОДСТВА, вырошчванне пладовых дрэў, пераважна яблынь і груш, прышчэпліваннем іх на нізкарослыя прышчэпы. Дрэвы на такіх прышчэпах пачынаюць рана плоданасіць. Якасць пладоў (велічыня, цукрыстасць, колер) вышэйшая за якасць на высакарослых прышчэпах. Невялікія памеры дрэў аблягчаюць догляд іх і збор ураджаю, даюць магчымасць павялічыць густычыню пасадкі да 800—1000 дрэў на 1 *га* і збіраць ураджай пладоў з 8—10-гадовых дрэў 30—60 *т/га*.

Карлікавыя прышчэпы менш зімаўстойлівыя, чым высакарослыя, таму іх найб. культывуюць на Пд СССР. У БССР рэкамендаваны прышчэпы карлікавыя — Парадзізка чырваналістая № 134 і паўкарлікавыя — ММ104, ММ106, ММ109. Прамысл. культура на іх магчыма ў паўд. і паўд.-зах. раёнах рэспублікі.

Літ.: Будаговский В. И. Промышленная культура карликовых плодовых деревьев, М., 1963; Попов Б. А. Размножение карликовых подвоев, 2 изд., М., 1964. *Р. К. Каваленка.* Самахвалавічы, Мінскі р-н.

КАРЛІКАВЫ РОСТ, панізм (грэч. nanos карлік), ненармальна нізкі рост чалавека. Адна з хвароб пярэдняй долі гіпофіза. Гл. *Гіпофіза хваробы*.

КАРЛІКАВЫЯ РАСЛІНЫ, расліны, якія маюць ненармальна нізкі для пэўнага віду рост.

Карлікавасць выклікаецца рознымі прычынамі: неспрыяльнымі глебава-кліматычнымі фактарамі, недастатковым жыўленнем, недахопам вільгаці, прышчэпліваннем пладовых дрэў на нізкарослыя прышчэпы (гл. *Карлікавае пладаводства*). Вырошчваюцца К. р. (хвоі, клёны, елкі і інш.) як дэкар. для бардзюраў, альпінарыяў.

КАРЛОВІЧ (Karłowicz) Мечыслаў (11.12.1876, в. Вішнеў Свянцянскага пав. Віленскай губ.— 8.2.1909), польскі кампазітар, скрыпач, дырыжор, крытык і музычны дзеяч. Сын Я. *Карловіча*. З 1905 дырэктар Варшаўскага муз. т-ва. У 1906 зблізіўся з прагрэс. групай кампазітараў «Маладая Польшча». К. — першы значны польскі сімфаніст, спалучаў поль-

скія, літ., бел. фальклорныя элементы (бел. тэмы выкарыстаны ў «Літоўскай рапсодыі» для сімф. аркестра, 1906, у сімф. трыпціху «Адвечныя песні», 1906) з традыцыямі польскай і рус. класікі, асабліва П. Чайкоўскага. Сярод найб. вядомых твораў: сімфонія «Адраджэнне» (1902), сімф. паэмы «Зваротныя хвалі» (1904), «Станіслаў і Ганна Асвенцімы» (1907), канцэрт для скрыпкі з арк. (1902).

Літ.: Болва И. Мечислав Карлович, М.— Л., 1951; Карасиньская И. Ян и Мечислав Карловичи..., у кн.: Русско-польские музыкальные связи. М., 1963.

КАРЛОВІЧ (Karłowicz) Ян (28.5.1836, в. Субартавічы Троекскага пав. Віленскай губ.—14.6.1903), польскі лінгвіст, этнограф, музыказнавец. Чл.-кар. Кракаўскай АН (1877). Сын памешчыка. Вучыўся на гістор.-філал. ф-це Маск. ун-та (1853—57), у Парыжы і Гейдэльберзе (1857—59), у Брусельскай кансерваторыі (1859—60). У 1871—82 жыў на Беларусі — у маёнтках Падзітва Лідскага пав. і Вішнеў Свянцянскага пав. З 1887 у Варшаве. Аўтар прац: «Дапаможнік для збіральнікаў народных твораў» (1871), «Найноўшыя даследаванні паданняў і іх аборы» (1883), «Нарыс жыцця і творчасці Станіслава Манюшкі» (1884—85), «Польская хата» (1884), «Сістэматыка песень польскага народа» (1889—95), «Міфалогія і філасофія» (1899), «Слоўнік польскай мовы» (т. 1—8, 1900—27, з А. Крынскім і В. Нядзведскім), «Слоўнік польскіх гаворак» (т. 1—6, 1900—11, закончыў Ян Лось), «Слоўнік выразаў замежнага і менш вядомага паходжання...» (А—К, 1894—97) і інш. З 1868 запісваў бел. нар. казкі і інш. фальклорна-этнагр. матэрыялы. У працы «Народныя паданні і казкі, сабраныя ў Літве» (1887—88) надрукаваў у перакладзе на польскую мову больш за 80 бел. паданняў і казак, запісаных ім у Свянцянскім, Лідскім і Навагрудскім пав. Для М. Федароўскага запісаў у 1889 і 1891 больш за 500 мелодый бел. нар. песень (апубл. ў працы Федароўскага «Люд беларускі», т. 5, 1958, т. 6, 1960). У прадмове да зб. У. Вярыгі «Беларускія паданні» (Львоў, 1889) прызнаваў за беларусамі права на самастойнае развіццё, заклікаў вучоных даследаваць бел. мову, фальклор, нар. побыт. Перапісваўся з А. Гурыновічам, М. Янчуком, Вярыгам, Бірутай, Федароўскім і інш., заахвочваў іх збіраць бел. фальклор. Шмат бел. фальклорна-этнагр. матэрыялаў, сабраных этнографамі, друкаваў у час. «Wisła» (*«Вісла»*), які рэдагаваў у 1888—99, або перадаваў на публікацыю ў час. «Zbiór wiadomości do antropologii krajowej» (*«Збор весцяў да антрапалогіі краёвай»*). Рэцэнзаваў працы П. Шэйна, М. Доўнар-Запольскага і інш. Доўгія гады сябраваў з Ф. Багушэвічам.



Літ.: Кіслёў Г. Францішак Багушэвіч і Ян Карловіч, у яго кн.: З думай пра Беларусь, Мн., 1966; Życie i prace Jana Karłowicza, Warszawa, 1904; Gajkowa O. Jan Karłowicz i Ludwik Krzywicki jako reprezentanci dwu nurtów w etnologii polskiej, Wrocław, 1959. *І. У. Саламевіч.* Мінск.

«КАРЛСБАД», умоўная назва карнай аперацыі ням.-фаш. захопнікаў супраць партызанаў і мірнага насельніцтва Магілёўскай і Мінскай абл. у 1942. Праводзілася 10—23.10.1942 сіламі матарызаванай брыгады СС, 3 палкоў, 2 батальёнаў, рэзервовай часці вермахта і спец. камандаў СД пад кіраўніцтвам нач. СС і паліцыі групы армій «Цэнтр» Бах-Залеўскага ў 4-вугольніку: шаша Магілёў — Мінск (Пд) — чыг. Барысаў — Орша (Пн) — р. Аслік (У) — р. Бярэзіна і Бобр (З). Карнікі імкнуліся акружыць і знішчыць партызанаў і расправіліся з мірным насельніцтвам: спалілі в. Гаенка, Паляжаеўка, расстралялі 1051 чал., пераважна жанчын, дзяцей і старых. Партызаны ў баях з карнікамі забілі і паранілі 99 гітлераўцаў. *В. С. Лазебнікаў, А. А. Фактаровіч.* Мінск.

КАРЛЮК Анатоль Сямёнавіч (н. 16.4.1922, Гомель), беларускі савецкі філосаф. Д-р філас. н. (1966), праф. (1967). З рабочых. Чл. КПСС з 1952. Скончыў фізіка-матэм. ф-т Гомельскага пед. ін-та (1948). У 1952—56 старшы навук. супрацоўнік Ін-та філасофіі АН БССР. У 1956—59 дацэнт кафедры фізікі, у 1959—67 дацэнт, а з 1967 праф. кафедры філасофіі Бел. політэхн. ін-та. Аўтар прац па філас. праблемах фізікі, пытаннях атэізму і крытыкі бурж. філасофіі.

Тв.: Реакционная сущность «физического» идеализма. Мн., 1954; О материалистических воззрениях в отечественной физике, Мн., 1957; Очерки по научному атеизму, Мн., 1961; Борьба материализма и идеализма в отечественной физике (вторая половина XIX и начало XX вв.), Мн., 1965.

КАРМА, гар. пасёлак (з 1938), цэнтр Кармянскага р-на Гомельскай вобл., прыстань на правым беразе р. Сож. За 110 *км* на ПнЗ ад Гомеля, 55 *км* ад чыг. ст. Рагачоў. 4,1 тыс. ж. (1971). Прамысл. прадпрыемствы: тканкавая ф-ка, ільнозавод, камбінаты буд. матэрыялаў і быт. абслугоўвання, пладова-агародніны з-д, спіртзавод, хлебазавод, раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі, Лепяшынскае спецыялізаванае аддз. Сельгастэхнікі. 2 сярэднія школы, школа-інтэрнат, школа рабочай моладзі, муз. і спарт. школы, 2 дзіцячыя яслі-сады. Дом культуры, 2 б-кі, бальніца. На брацкай магіле

Карма. Галоўная плошча.



помнік членам Кармянскага рэўкома, якія загінулі ў час кулацкага мяцяжу 1919. На брацкай магіле помнік 72 сав. воінам і партызанам Айч. вайны.

К. вядома з 17 ст. як мяст. Гомельскага староства. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. Мяст., цэнтр воласці Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ. У сак.— крас. 1917 у К. створаны Савет рабочых дэпутатаў. Сав. ўлада ўстаноўлена ў ліст. 1917. У 1918—19 у воласці працаваў П. М. Лепяшынскі. З жн. 1941 да ліст. 1943 акупавана ням.-фаш. захопнікамі. *М. З. Авеев.* Гомель.

КАРМА, вёска ў Добрушскім р-не Гомельскай вобл., каля р. Хорапуць (1 *км*). Цэнтр сельсавета і калгаса «Абарона». За 17 *км* на ПдУ ад Добруша, 45 *км* ад Гомеля, 12 *км* ад чыг. ст. Закапыцце, на аўтамаб. дарозе, якая злучае вёску з шашою Гомель — Бранск (РСФСР). 1650 ж., дварэў 646 (1971). Майстэрня быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, Палац культуры, б-ка, дзіцячы сад, фельч.-ак. пункт, адд. сувязі, сталовая, 3 магазіны. Помнік на брацкай магіле 15 воінаў грамадз. вайны. У 1941 вёску спалілі ням.-фаш. захопнікі.

КАРМАВАЯ АДЗІНКА, адзінка вымярэння агульнай пажыўнасці *кармоў*. У СССР адпавядае пажыўнасці 1 *кг* аўса сярэдняй якасці.

К. а.— прыватны паказчык комплекснай ацэнкі кормоў, пры якой улічваецца, акрамя агульнай, бялковая, мінер., вітамінная і амінакіслотная пажыўнасць. Пажыўнасць кормоў ацэньваюць і па абменнай энергіі (энергія засвоеных жывёлай арган. рэчываў корму). За энерг. кармавую адзінку прынята 2500 *ккал* абменнай энергіі.

Літ.: Состав и питательность кормов Белоруссии, Мн., 1962; Новые данные химического состава и питательности кормов Белорусской ССР, Мн., 1969 (бібліягр.).

КАРМАВАЯ БАЗА, планамерная вытворчасць і рацыянальнае выкарыстанне кармоў для с.-г. жывёлы. Патрэба ў *кармах* вызначаецца на аснове дзярж. планаў вытворчасці жывёлагадоўчай прадукцыі.

К. б. ў калгасах і саўгасах Беларусі расшыраецца і ўмацоўваецца за кошт павелічэння пасяўной плошчы і ўраджайнасці кармавых культур, слуўбы найб. ураджайных для мясцовых умоў культур, павышэння прадукцыйнасці прыродных кармавых угоддзяў, стварэння высокапрадукцыйных лугоў і пашы, павелічэння вытворчасці камбікармоў, выкарыстання адходаў харч. прамысловасці і інш. Асаблівая ўвага аддаецца павелічэнню вытворчасці высакаякасных кармоў, багатых на бялкі, вітаміны і мінер. рэчывы: расшырэнню пасеваў бабовых культур на зерне, сілас, зялёны корм, вытворчасці сенажу, угнойванню пасеваў і кармавых угоддзяў, своечасовай уборцы і правільнаму хаванню кармоў.

Літ.: Пельт Н. Н. Развитие кормовой базы животноводства в СССР. М., 1968; Половенко И. С. О качестве кормов для животноводства. Эффективность методов укрепления и повышения качества кормовой базы, М., 1970. *А. А. Козыр.* Жодзіна.

КАРМАВЫ РАЦЫЁН, норма *кармоў* для жывёлы на пэўны час (суткі, перыяд, сезон, год).

Складаецца ў адпаведнасці з патрэбаю жывёлы ў асн. пажыўных рэчывах, з улікам прыродных і гасп. умоў, запасаў кармоў у гаспадаркі, іх якасці і кошту. Паўнацэннасць К. р. вызначаецца суадносінамі пажыўных рэчываў у кармах, іх уплывам на здароўе і прадукцыйнасць жывёлы.

Літ.: Нормы и рационы кормления сельскохозяйственных животных, 5 изд., М., 1969; Лемеш В. Ф., Шпаков А. П. и Наваров В. К. Кормовые нормы и таблицы, Мн., 1966.

КАРМАВЫЯ КАРАНЯПЛОДЫ, двухгадовыя расліны з сакаўнымі каранямі (каранеплодамі), якія ідуць на корм. Да іх належаць *буракі* (кармавыя і паўцукровыя), *морква*, *бручка* і *турнэпс*. К. к.— малакагонны і дыетычны корм, багаты на лёгказасваяльныя пажыўныя рэчывы і вітаміны. Бацвінне выкарыстоўваецца свежае і сіласаванае.

Сярэднія ўраджаі 400—500 *ц/га*. Паводле даследаванняў Бел. НДІ земляробства пры вырошчванні К. к. на суглінкавых, супескавых і тарфяна-балотных глебах найбольш пажыўных рэчываў з 1 *га* даюць буракі і морква. Бручку, моркву і турнэпс можна вырошчваць як прамежкавыя культуры: моркву і турнэпс пасяваюць пад азімае жыта ўвесну, турнэпс і бручку высаджваюць таксама пажніўна пасля культур, якія рана ўбіраюць. На асушаных тарфяна-балотных глебах лепш растуць буракі і морква, бручку і турнэпс часта псуюць шкоднікі.

Літ.: Козловский А. И. и Жамойдик Р. И. Кормовые корнеплоды, Мн., 1967; Тишкевич И. И. Кормовые корнеплоды на торфяно-болотных почвах, Мн., 1955.
А. І. Казлоўскі. Жодзіна.

КАРМАВЫЯ КУЛЬТУРЫ, адна-, двух- і шматгадовыя расліны, якія вырошчваюцца на корм жывёле. Размяшчаюцца пераважна ў палявых і кармавых севазваротах. Ужываюцца свежыя (пашавы корм, зялёная маса, караняплоды), сушаныя, сіласаваныя. На Беларусі на корм вырошчваюць *кармавыя травы*, *зернебабовыя культуры*, *сіласныя культуры*, *кармавыя караняплоды*, *клубняплоды*, зернефуражныя культуры (авёс, ячмень і інш.). Правільны падбор К. к. у кожнай гасп. і атрыманне высокіх ураджаяў — важнае мерапрыемства для павышэння рэнтабельнасці жывёлагадоўлі і зніжэння сабекошту прадукцыі.

Літ.: Новые данные химического состава и питательности кормов Белорусской ССР. Мн., 1969 (бібліягр.). *Б. М. Журавель.* Жодзіна.

КАРМАВЫЯ СЕВАЗВАРОТЫ, севазвароты, якія ўводзяцца на тое, каб вырошчваць *кармавыя культуры*; узаемазвязаны з *палявымі севазваротамі*.

На Беларусі пашыраны 2 тыпы К. с.: лугапашавыя — забяспечваюць жывёлу пашаю, зялёнай падкормкай, сенажом і сенам (шматгадовыя травы займаюць больш як 50%); прыферменскія — размяшчаюцца паблізу жывёлагадоўчых фермаў, вырошчваюцца кармавыя караняплоды, сіласныя культуры і аднагадовыя травы (пераважна кармавы лубін у сумесі з інш. культурамі).

Літ.: Севообороты, М., 1959; Прокопов П. Е. Агротехнические основы севооборотов, Мн., 1967.
А. А. Гнаюк. Мінск.

КАРМАВЫЯ СУМЕСІ (кармавыя мяшанкі), сумесныя пасевы некалькіх відаў аднагадовых культур на адным участку для атрымання больш высокіх ураджаяў кармоў лепшай якасці. Выкарыстоўваюцца на зялёны корм, сілас, зерне, сена. К. с. неабходныя пры вырошчванні культур з павойным сцяблом (віка, гарох, пялюшка), каб папярэдзіць паляганне. Адрозніваюць простыя (з двух відаў раслін) і складаныя К. с. (з трох і больш кампанентаў). На Беларусі на зялёны корм і сілас высяваюць зерневыя і інш. культуры разам з бабовымі (віка яравая з аўсом, пялюшка з аўсом, гарох з аўсом, авёс з пялюшкай і лубінам, сланечнік з пялюшкай, сланечнік з лубінам, азімае жыта з вікай азімай і інш.), сумесі з 4—5 культур (кукуруза, сланечнік, авёс, кармавы лубін, гарох і інш.).

Літ.: Елсуков М. П. и Тютюнников А. И. Однолетние кормовые культуры в смешанных посевах, М., 1959; Шишкин А. И. Силосные культуры в уплотненных посевах, М., 1969.

Б. М. Журавель. Жодзіна.

КАРМАВЫЯ ТРАВЫ, адна- і шматгадовыя травяністыя расліны, якія ідуць на корм жывёле ў выглядзе сена, зялёнага корму, сіласу, сенажу, травяной мукі. Вырошчваюцца ў кармавых і палявых севазваротах. Большасць расце на прыродных сенакосах і пашы. Падзяляюцца на 4 групы: злакавыя, бабовыя, асаковыя, разнатраўе. Найб. кармавую вартасць маюць злакавыя і бабовыя.

Злакавыя пераважаюць на прыродных кармавых угоддзях, з'яўляюцца асн. кампанентам культурнай пашы і сенакосаў. На Беларусі вырошчваюць аднагадовыя (райграс аднагадовы) і шматгадовыя злакавыя (каласоўнік безасцюковы, купкоўка зборная, цімафееўка лугавая; аўсяніца лугавая, чырвоная, трыснёгападобная, авечая; райграс высокі і пашавы; метлюжок лугавы і балотны; лісахвост лугавы, мятліца белая, бекманія, чаротніца трыснёгападобная). Да групы бабовых належаць расліны сям. матыльковых. Кармавая вартасць іх высокая (надземная маса багатая на пратэін). На Беларусі вырошчваюць аднагадовыя (віка пасевная і азімая, лубін кармавы, пялюшка, сырадэля, баркун) і шматгадовыя бабовыя (канюшына чырвоная, ружовая, белая; люцэрна сіняя, гібрыдная, жоўтая; рутвіца рагатая). Да групы асаковых належаць расліны сям. асаковых і сітавых. Іх дрэнна паядае жывёла, кармавая вартасць нізкая. Разнатраўе ўключае расліны астатніх бат. сямействаў. Гл. звесткі пра вышэйпамянёныя К. т. ў арт. пра род адпаведных раслін.

Літ.: Коркина В. Ф. Особенности роста и развития многолетних кормовых растений, М.—Л., 1964; Культурные сенокосы и пастбища — источник дешевых кормов, Мн., 1966.

К. С. Уласава. Жодзіна.

КАРМА-ПАЎКІ, вёска ў Навасельнінскім с/с Краснапольскага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр калгаса імя Жданава. За 20 *км* на ПдЗ ад Краснаполля, 161 *км* ад Магілёва, 82 *км* ад чыг. ст. Крычаў. 265 ж., двароў 64 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, магазін.

КАРМЕЛІТЫ (лац. Carmeliti), манахі каталіцкага ордэна, засн. каля 1154 у Палесціне. Назву атрымалі ад гары Кармель, дзе знаходзілася першая абшчына К. У сярэдзіне 13 ст. перасяліліся ў Зах. Еўропу. У 1247 ордэн К. зацверджаны рымскім папам Інакенціем IV як адзін з *жабрацкіх ордэнаў*. З канца 14 ст. сталі хутка пашырацца ў Польшчы, адкуль праніклі ў Вял. кн. Літоўскае. Першыя манастыры і касцёлы К. на тэр. Беларусі заснаваліся ва ўсіх раёнах на мяжы Рэчы Паспалітай з Рускай дзяржавай, дзе ўплыў каталіцызму быў меншы. Дзейнасць К., як і інш. каталіцкіх манаскіх ордэнаў, накіроўвалася на акаталічванне бел. насельніцтва, на адрыў бел. народа ад братняга рускага. Манастыры і касцёлы К. былі ў Мсціславе (з 1623), Вялынічах (з 1623), Глыбокім (з 1639), Чавусах (з 1653), Магілёве (з сярэдзіны 17 ст.), Лідзе (з 1676), Мінску (з 1677), Жалудку (з 1685), Гродне, Брэсце, Пінску, Чэрыкаве і інш.— усяго 23. Дзейнасць манастыроў К. на Беларусі спынена ў сярэдзіне 19 ст. У розных краінах свету каля 20 тыс. К. Часта выступаюць як місіянеры (гл. *Місіянерства*) у краінах Азіі і Афрыкі, спрыяюць палітыцы неакаланіялізму.

Дз. М. Мацяс. Мінск.

КАРМУНІН Павел Васілевіч (н. 28.1.1919, с. Вялікія Ключы Казьмадзям'янскага пав. Казанскай губ.), рускі і беларускі савецкі акцёр. Засл. арт. БССР (1970). Чл. КПСС з 1943. У 1939—46 у Сав. Арміі. У 1946—64 працаваў у рус. т-рах. З 1964 у Бел. т-ры імя Я. Купалы. Характарны акцёр. Лепшыя ролі: Іліко («Я, бабуля, Іліко і Іларыён» Н. Думбадзе і Р. Лордкіпанідзе), Максім Пятроў («Традыцыйны збор» В. Розава), Лука («На дне» М. Горкага), Вайніцкі («Дзядзька Ваня» А. Чэхава), Чарнушка («Людзі на балоце» паводле І. Мележа), Кропля («Капстанція Заслонаў» А. Маўзона), Кічкайла («Амністыя» М. Матукоўскага). Здымаецца ў кіно («Дзесятая доля дарогі», «Красная плошча», «Рудабельская рэспубліка» і інш.).

КАРМЫ, прадукты расліннага, жывёльнага і мінеральнага паходжання для кармлення с.-г. жывёлы. Каштоўнасць К. вызначаецца *пажыўнасцю кармоў*, іх дыэтычнымі ўласцівасцямі і ўплывам на якасць жывёлагадоўчай прадукцыі. Асн. крыніца К.— пасевы *кармавых культур* і прыродныя кармавыя ўгоддзі; значнае месца ў кармавым балансе займаюць адходы паляводства, агародніцтва, харч. прамысловасці.

К. раслiннага паходжання — *зялёная карма, сянаж, грубыя кармы, кармавыя каранеплоды, клубнеплоды, сілас, канцэнтраваныя кармы*. К. жывёльнага паходжання — *мясная мука*, мяса-касцявая мука, *рыбная мука, малако, адгон*, масляны, сыроватка і інш.; яны багатыя на паўнацэнныя бялкі, мінер. рэчывы і вітаміны. Мінеральныя К.— мел, спажыўная соль, абясфторанны фасфат, *костная мука* і інш. Мінер. К.— важная крыніца кальцыю, фосфару, натрыю, хлору, жалеза і інш. элементаў, якіх не хапае ў кармавым рацыёне.

Літ.: Томмэ М. Ф. Корма СССР. Состав и питательность, 4 изд., М., 1964; Попов Н. С. Кормление сельскохозяйственных животных, 9 изд., М., 1957; Новые данные химического состава и питательности кормов Белорусской ССР, Мн., 1969 (бібліягр.).

У. В. Шчаглоў. Жодзіна.

КАРМЫЗАВА Кацярына Пятроўна (н. 28.1.1920, в. Прылёпаўка Чавускага пав. Гомельскай губ.), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1966). У 1945—53 калгасніца калгаса імя Леніна Лідскага р-на Гродзенскай вобл. З 1953 птушніца Мінскай птушкафабрыкі імя Крупскай. Дэп. Вярх. Савета БССР 7-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, медалямі.

КАРМЭН Раман Лазаравіч [н. 16(29).11.1906, Адэса], рускі савецкі рэжысёр і аператар дакументальнага кіно, журналіст і сцэнарыст. Нар. арт. СССР (1966). Чл. КПСС з 1930. Скончыў Дзярж. ін-т кінематаграфіі (1932). Фільмы: «Іспанія» (1939, рэж. Э. Шуб), «Дзень новага свету» (1940, з М. Слуцкім), «У Кітаі» (1941), «Суд народаў» (1946), «Шырокая краіна мая...» (1958), «Раніца Індыі» (1959), «Востраў у агні» (1961), «Вялікая Айчынная» (1965), «Гранада, Гранада, Гранада мая!» (1967), «Аповесць пра нафтавікоў Каспія» і «Пакарыцелі мора» (1953, 1959, Ленінская прэмія 1960). Дзярж. прэміі СССР 1942, 1947 і 1952. Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі.

Тв.: По странам трех континентов, М., 1962.
Літ.: Колесникова Н., Сенчакова Г. и Слепнева Т. Роман Кармен, М., 1959.

КАРМЯНСКІ РАЁН, у складзе Гомельскай вобл. БССР. Утвораны 17.7.1924. Размешчаны на Пн вобл., у сярэднім цячэнні Сажа. Пл. 0,9 тыс. *км*². Нас. 32,5 тыс. чал. (1971). Падзяляецца на 12 сельсаветаў, цэнтр г. п. Карма.

Рэльеф раўнінны, на Пн заходзіць Аршанска-Магілёўская раўніна. Выш. да 176 *м* над узр. м. Карысныя выкапні: 2 радовішчы мелу з агульн. запасамі 1,2 млн. *т*, у т. л. радовішча Рудня (каля в. Кароцькі) — 0,9 млн. *т*;



4 радовішчы цагельнай сыравіны—0,6 млн. *м*³, у т. л. радовішча Сапажкі — 0,2 млн. *м*³; радовішча буд. пяску Каменнік (каля в. Студзянец), запасы 0,5 млн. *м*³. Сярэдняя т-ра студз. —7,3, ліп. 18,3 °С. Ападкаў 600 *мм* за год. Вегет. перыяд 190 дзён. З ПнУ на Пд раён перасякае Сож з прытокамі Касалянка, Кармянка, Добрыч, Горна (справа), Кляпінка, Жавуніца (злева). Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (21,7%), дзярнова-падзолістыя забалачальныя (41,0%), дзярнова-балотныя (10,6%), тарфяна-балотныя і алювіяльныя (26,7%). З мінер. глебаў 53,8% суглінкавых, 34,9 супясчаных, 11,3% пясчаных. Якасная ацэнка глебаў у балах: ворных зямель 51 (цана бала 0,21 *ц/га* збожжа), кармавых угоддзяў — 27, усіх с.-г. угоддзяў — 43. Пад лесам 23,7% тэр., пераважае хвоя. Есць драбналістыя пароды (бяроза, вольха, асіна). Насяляюць раён беларусы, рускія, украінцы і інш. Сярэдняя шчыльн. 36,1 чал. на 1 *км*². Гарадскога нас. 12,6%. Прамысл. прадпрыем-


Ворыва ў калгасе імя Лепяшынскага.


Жывёлагадоўчы комплекс у саўгасе «Кармянскі».

ствы: ткацкая ф-ка імя Клары Цэткін, ільнозавод, спіртзавод, хлебазавод, пладова-агародніннны з-д; камбінаты буд. матэрыялаў і быт. абслугоўвання, раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі і Лепяшынскае спецыялізаванае аддз. Сельгастэхнікі (Карма). У раёне 9 калгасаў і 9 саўгасаў (1971).

Калгасы і іх цэнтры: «Бальшавік» (*Лужок*), імя Дзімітрова (*Ворнаўка*), «Камуніст» (*Дубавіца*), «Кастрычнік» (*Кучын*), імя Лепяшынскага (*Літвінавічы*), «Перамога» (*Карма*), «Радзіма» (*Струмень*), «Світанне» (Высокае), «Усход» (*Малянін*). Саўгасы і іх цэнтры: «Багданавічы» (*Хізаў*), імя Валадарскага (*Барсукі*), «Валынцы» (*Валынцы*), «Зара камунізма» (*Акцяброва*), «Кармянскі» (Карма), «Рудзінскі» (*Залатаміно*), «Стараградскі» (*Стараград*), «Струкачоўскі» (*Струкачоў*), імя Чапаева (*Баравая Буда*).

С. гасп. спецыялізуецца на малочна-мясной жывёлагадоўлі, вырошчваюць бульбу і збожжавыя. Пад с.-г. угоддзямі 69% тэрыторыі. Агульная пасяўная пл. (тыс. *га*, 1970) 39,5, у т. л. пад збожжавымі і зернебабовымі 19,2, тэхн. (лён) 1,4, бульбай 6,4, пад кармавымі культурамі 12,3. На пач. 1971 было (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 28,9 (у т. л. кароў 14,3), свіней 24,1, авечак і коз 2,6. Тэр. К. р. перасякаюць шашэйныя дарогі Карма — Журавічы, Карма — Доўск — Рагачоў. На пач. 1971 у раёне 12 сярэдніх, 12 васьмігадовых, 35 пач. школ, школа рабочай і сельскай моладзі, 27 масавых б-к, 27 клубных устаноў, 32 кінаўстаноўкі (у т. л. 21 стацыянарная), 5 бальніц, 17 фельч.-ак. пунктаў. У 1971 у раёне працавала 398 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, у т. л. 24 інжынеры, 63 аграномы, 260 настаўнікаў, 21 урач і інш.; 666 чал. з сярэдняй спец. адукацыяй. Раённая газ. «Зара над Сожам».

А. А. Шайрова. Мінск.

КАРНАВАЛ (італьян. carnevale ад лац. carrus navalis пацешлівая каляснiца-карабель), від масавага народнага гуляння з вулічнымі шэсцямі, маскарадамі, тэатралізаванымі гулянямі і інш. Назву К. атрымаў у Італіі ў канцы 13 ст.

КАРНАВУХАЎ Марка Лукіч [н. 21.10(3.11). 1900, в. Гор'е Дрысенскага пав. Віцебскай губ.], удзельнік грамадз. вайны, ген.-м. тэхн. войск (1949). З сям'і чыгуначніка. Чл. КПСС з 1928. Скончыў Ваен.-транспартную акадэмію (1937). У Чырв. Арміі з ліп. 1919. У ліп. 1919 — чэрв. 1920 на Зах. фронце — пам. начальніка, потым нач. станцыі. З 1937 нач.

ф-та акадэміі. У Айч. вайну на Паўн.-Зах., 2-м і 3-м Прыбалтыйскіх франтах — камандзір чыг. брыгады. З 1948 камандзір злучэння. З 21.7.1955 у адстаўцы. Узнаг. ордэнам Леніна, 5 інш. ордэнамі, медалямі. Жыве ў Ленінградзе.

КАРНАВУХАЎ Яўген Аляксандравіч [н. 10 (23).2.1917, в. Масева Пскоўскага пав.], рускі савецкі акцёр. Нар. арт. БССР (1955). Скончыў Ленінградскі тэатр. ін-т (1939, педагог В. Мяркур'еў). У Айч. вайну ў Сав. Арміі. У 1939—41, 1945—64 у Дзярж. рус. т-ры БССР імя М. Горкага. З 1964 у Маск. т-ры імя Маякоўскага. Акцёр гераіка-рамант. плана; выконваў характарныя ролі. Спалучаў востры сцэн. малюнак з эмацыянальнасцю выканання. Ролі: Фердынанд («Каварства і каханне» Ф. Шылера), Тэадора («Сабака на сене» Лопэ дэ Вэгі), Тузенбах («Тры сястры» А. Чэхава), Барыс Гадуноў («Цар Фёдар Іаанавіч» А. К. Талстога), Эдмунд («Кароль Лір» У. Шэкспіра), Чаркун («Варвары» М. Горкага), Сміт («Рускае пытанне» К. Сіманава), камандзір карабля («Аптымістычная трагедыя» У. Вішнеўскага), Платонаў («Акіян» А. Штэйна), Траўбэ, Дзянікін («Брэсцкая крэпасць», «Галоўная стаўка» К. Губарэвіча), Эдлай Гамільтан («Дзень нараджэння Тэрэзы» Г. Мдывані). Здымаўся ў кіно («Гадзіннік спыніўся апоўначы» і інш.).







Я. А. Карнавухаў у ролях Чаркуна (злева) і Эдмунда.

Літ.: Атрошчанка А. На шляху творчай сталасці, у кн.: Майстры беларускай сцэны. Мн., 1960. *Г. Р. Герштэйн.* Мінск.

КАРНАЛІТ (ад імя ням. горнага інжынера Р. фон Карналя), рудаўтваральны мінерал *калійных соляў*, хларыд калію і магнію $KMgCl_3 \cdot 6H_2O$.

Крышталізуецца ў рамбічнай сістэме, звычайна трапляецца ў зярністых масах, часам у таблітчастых, дыпірамідальных крышталях. Празрысты і бясколерны, прымесямі жалеза афарбаваны ў чырвоны, буры, жоўты колер. Цв. 2—3; шчыльн. 1600 *кг/м*³. Вельмі гіграскапічны. Выпадае ў асадак з расолаў. На Беларусі вылучена радовішча К. у Прыпяцкай упадзіне. Сыравіна для атрымання калію і магнію. Радовішчы ў СССР (Салікамск), ГДР, ФРГ, Паўн. Амерыцы, Афрыцы.

Літ.: Лупинович Ю. И. Некоторые минералогические особенности карналита Старобинского месторождения калийных солей, «Доклады АН БССР», 1962, т. 6, № 4.

КАРНАП (Carnap) Рудольф (н. 18.5.1891, Вупперталь, Германія), амерыканскі філосаф і логік, адзін з заснавальнікаў пазітывісцкага кірунку «філасофіі навукі» і *лагічнай семантыкі*. Навук. дзейнасць пачаў у складзе *Венскага гуртка*. У пач. 30-х г. адыходзіць ад лагічнага эмпірызму і развівае тэорыю лагічнага сінтаксісу як лагічных правілаў пабудовы навук. выказванняў і аналізу адносін паміж імі незалежна ад сэнсу. У далейшым К. прыйшоў да высновы пра неабходнасць уліваць пры аналізе мовы навукі адносіны паміж моваю і той галіною рэальнасці, якая апісваецца. На аснове тэорыі лагічнай семантыкі будуе індукцыйную логіку як імавернасную, а пазней распрацоўвае тэорыю семантычнай інфармацыі, ідэю фармалізацыі прагматыкі (раздзел семіётыкі). К. зрабіў значны ўплыў на развіццё матэм. логікі. Асобнымі вынікамі яго даследаванняў карыстаюцца ў кібернетыцы. Філасофіі К. ў цэлым уласціва эклектычнае спалучэнне ідэаліст. пазітывісцкіх ідэй з элементамі прыродазнаўчанавук. матэрыялізму.

Тв.: Рус. пер.— Значение и необходимость, М., 1959; Философские основания физики, М., 1971.

Літ.: Нарский И. С. Современный позитивизм, М., 1961. *М. В. Рожын.* Мінск.

КАРНАТЫТ (ад імя франц. горнага інжынера і хіміка А. Карно), мінерал, ванадат калію і урану $K_2[(UO_2)V_2O_8] \cdot 3H_2O$. Сыравіна для атрымання урану.

Змяшчае 63,4% UO_3, 20,2% V_2O_5. Трапляецца ў парашкападобных і зямлістых масах, радзей у дробных лускавінках і прамяністых агрэгатах. Колер жоўты з адценнямі, бляск шаўкавісты, матавы. Цв. 2—3,5; шчыльн. 4460 *кг/м*³. Радыеактыўны. Паходжанне гіпергеннае. Радовішчы ў ЗША, Аўстраліі, Рэспубліцы Заір.

КАРНАЧ Сцяпан Андрэевіч (н. 10.11.1913, в. Клінок Ігуменскага пав. Мінскай губ.), Герой Сав. Саюза (1944), ген.-м. (1957). З сялян. Чл. КПСС з 1943. Скончыў Ваен. акадэмію Ген. штаба (1958). У Чырв. Арміі з 1938. У Айч. вайну з 22.6.1941 на Паўд., Паўд.-Зах., Паўн.-Каўказскім, Сцяпным, 2-м і 1-м Укр. франтах — камандзір знішчальнага авіяц. палка. Удзельнік баёў на Каўказе, Курскай дузе, Украіне, у Польшчы, Германіі, Чэхаславакіі. Зрабіў 346 баявых вылетаў, удзельнічаў у 84 паветраных баях, збіў 16 варожых самалётаў, 4 — у групе. Служыць у Сав. Арміі.



КАРНАЧОНАК Мікалай Аляксандравіч (1922, в. Баркі Аршанскага пав. Віцебскай губ.— 22.9.1942), Герой Сав. Саюза (1942). З сялян. Канд. у чл. КПСС. У Чырв. Арміі з 1940. У Айчынную вайну на Паўднёва-Заходнім і Сталінградскім франтах — лётчык. Зрабіў 349 баявых вылетаў, збіў 10 варожых самалётаў. Загінуў у баі.



КАРНЕЕВА Ніна Аляксееўна (н. 23.7.1920, Рцішчава Сярдобскага пав. Саратаўскай губ.), руская савецкая актрыса. Засл. арт. БССР (1967). Чл. КПСС з 1961. Скончыла тэатр. студыю Маск. камернага т-ра (1946). Працавала ў т-рах Тулы, Масквы, Алма-Аты (1946—57). З 1957 у Гомельскім драм. т-ры. Выканаўца востраха рактарных, камед. роляў. Сярод лепшых: Мігачова («Не было ні гроша, ды раптам шастак» А. Астроўскага), Акуліна Іванаўна («Мяшчане» М. Горкага), Мар'я («Любоў Яравая» К. Транёва), Праскоўя Дзмітрыеўна («Старая дзеўка» І. Штока), Жыгоцкая («Вайна пад стрэхамі» паводле А. Адамовіча), Люсі Купер («Саступі месца заўтрашняму дню» В. Дэльмар).

КАРНЕЕНКА Уладзімір Якаўлевіч (н. 15.7.1924, в. Губеншчына Чэрыкаўскага пав. Гомельскай губ.), кавалер ордэнаў Славы трох ступеняў. З сялян. Чл. КПСС з 1958. У Айч. вайну з снеж. 1943 на 2-м Бел. і Далёкаўсходнім франтах — ст. сяржант, камандзір кулямётнага разліку. Вызначыўся пры вызваленні Беларусі і Польшчы. 28.2.1944 у Быхаўскім р-не Магілёўскай вобл. знішчыў варожы станковы кулямёт; у пачатку ліп. 1944 у Смалявіцкім р-не Мінскай вобл. з разлікам прабраўся ў тыл непрыяцеля, пасеяў паніку, гэтым дапамог сав. падраздзяленням прарваць ням. паэіцыі; у студз. 1945 адбіў 5 варожых контратак. Жыве на радзіме.

КАРНЕЕЎ Якаў Фёдаравіч (1910, в. Крывашэўка Ніжнеломаўскага пав. Пензенскай губ.— 1950), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1942. На фронце з 1941 — сувязіст. Вызначыўся ў Лоеўскім р-не Гомельскай вобл. 28.9.1943 у час пераправы цераз Дняпро паранены 4 гадзіны падтрымліваў сувязь. Ліквідаваў 15 пашкоджанняў лініі.

КАРНЕЛЬ (Corneille) П'ер (6.6.1606, Руан — 1.10.1684), французскі драматург, прадстаўнік класіцызму. З сям'і адваката. Чл. Франц. акадэміі (1647). Літ. дзейнасць пачаў з вершаў (зб. «Паэтычная сумесь», 1632). Першая спроба ў жанры камедыі — «Меліта, ці Падложныя пісьмы» (паст. 1629), у жанры трагедыі — «Медэя» (паст. 1635). У аснове трагікамедыі «Сід» (паст. 1637; сюжэт запазычаны ў іісп. драматурга Г. дэ Кастра) — псіхал. канфлікт, які адлюстроўваў супярэчнасці паміж асобай і дзярж. інтарэсамі абсалютызму. У трагедыі «Гарацый» (паст. 1640) сямейны абавязак, асабістыя пачуцці падпарадкаваны абавязку грамадзянскаму, дзяржаўнаму. Творы К. прасякнуты грамадз. пафасам. Абаронца абсалютнай манархіі, К. крытыкаваў дэспатызм каранаваных тыранаў. Аўтар трагедый «Цына» (паст. 1640—41), «Палеўкт» (паст. 1641—42), «Смерць Пампея» (паст. 1643), «Нікамед» (паст. 1651), «Эдып» (паст. 1659), драмы «Радагуна» (паст. 1644—45), камедый «Хлус» (паст. 1643), «Дон Санча Арагонскі» (паст. 1649) і інш. Надаў французскай класічнай трагедыі палітычны характар.



Тв.: Рус. пер.— Избр. трагедии, М., 1956.

КАРНІЁНКА Іван Майсеевіч (1920, пас. шахты імя Лоцікава Славянасербскага пав. Екацярынаслаўскай губ.— 18.1.1945), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). На фронце з 1942 — кулямётчык. Вызначыўся ў баі за плацдарм на р. Бярэзіна каля в. Шчаткава Бабруйскага р-на. Адбіў некалькі варожых атак, падпаліў танк і знішчыў групу гітлераўцаў.

КАРНІЛАЎ Лаўр Георгіевіч [6(18).8.1870, Сяміпалацінская вобласць — 13.4.1918], адзін з лідэраў рус. контррэвалюцыі. У 1-ю сусв. вайну камандаваў дывізіяй. У 1917 камандуючы войск Петраградскай ваен. акругі, 8-й арміі, Паўд.-Зах. фронту; 18(31).7—27.8(9).1917 вярх. галоўнакамандуючы. К. увёў пакаранне смерцю на фронце, абмежаваў дзейнасць салдацкіх к-таў. У канцы жніўня 1917 накіраваў войскі на Петраград, каб устанавіць ваен. дыктатуру. Пасля ліквідацыі мяцяжу (гл. *Карнілаўшчына*) 2(15) вер. арыштаваны і зняволены ў турму ў Быхаве Магілёўскай губ. 19 ліст. (2 снеж.) збег у Новачаркаск, дзе з ген. М. В. Аляксеевым узначаліў белагвардз. добраахвотніцкую армію. Забіты ў час штурму Екацярынадара.

У. Г. Івашын. Мінск.

КАРНІЛАЎ Уладзімір Аляксеевіч [1806, Цвярская губ.— 5(17).10.1854], герой Севастопальскай абароны 1854—55, віцэ-адмірал (1852). З дваран. Скончыў Марскі кадэцкі корпус (1823). Служыў на Балтыйскім (1823—27, 1830—34) і Чарнаморскім (1827—30, з 1834) флотах. Удзельнік Наварынскай бітвы 1827, руска-турэцкай вайны 1828—29. У 1842—46 камандзір карабля. З 1849 нач. штаба Чарнаморскага флоту. У *Крымскую вайну 1853—56* узначаліў абарону Севастопаля, быў нач. штаба гарнізона. Загінуў на Малахавым кургане ў час бамбардзіроўкі. Пахаваны ў Севастопалі.

Літ.: Вице-адмирал Корнилов. [Сб. документов], М., 1947; Зверев В. И. Вице-адмирал В. А. Корнилов, Симферополь, 1957. *Ю. А. Афонін.* Мінск.

КАРНІЛАЎШЧЫНА (карнілаўскі мяцеж), контррэвалюц. мяцеж у жн. 1917 пад

кіраўніцтвам вярх. галоўнакамандуючага ген. Л. Г. Карнілава з мэтай разгрому рэвалюц. сіл і ўстанаўлення ваен. дыктатуры ў Расіі. Праграма К. выпрацавана на *Дзяржаўнай нарадзе* 12—15 (25—28).8.1917 у Маскве. Гал. роля ў змове належала *кадэтам*. Змоўцаў падтрымлівалі імперыялісты Англіі, Францыі, ЗША, якія баяліся далейшага развіцця рус. рэвалюцыі. Часовы ўрад на чале з А. Ф. Керанскім сеяў канстытуцыйныя ілюзіі, адначасова ўдзельнічаў у падрыхтоўцы К., цэнтрам якой стала Стаўка вярх. галоўнакамандуючага ў Магілёве. У Стаўцы і штабах франтоў фарміраваліся контррэвалюц. ўдарныя часці, якія планавалася накіраваць супраць рэвалюц. цэнтраў; у Петраградзе, Маскве і інш. ствараліся афіцэрскія арг-цыі, якія павінны былі падтрымаць выступленне Карнілава. 21.8(3.9).1917 Карнілаў здаў немцам Рыгу, каб абвінаваціць бальшавікоў у разлажэнні арміі і пачаць ваен. дзеянні. 25.8(7.9).1917 ён накіраваў 3-і конны корпус ген. Крымава, у т. л. «дзікую дывізію» з горцаў Каўказа, на Петраград, адначасова патрабаваў адстаўкі Керанскага. Баючыся страціць уладу, Керанскі абвясціў Карнілава мяцежнікам і зняў з пасады глаўкаверха. Арганізатарамі і кіраўнікамі барацьбы супраць К. сталі бальшавікі. Змагаючыся з К., яны выкрывалі і контррэвалюц. сутнасць Часовага ўрада. Барацьба супраць К. набыла агульнадэмакр. характар. 27.8(9.9).1917 ЦК РСДРП(б) звярнуўся да рабочых і салдатаў Петраграда з заклікам стаць на абарону рэвалюцыі. За 3 дні ў Чырв. гвардыю запісалася 25 тыс. рабочых Петраграда. Супраць карнілаўскіх войск накіраваны салдаты рэвалюц. часцей петраградскага гарнізона, маракі Балт. флоту, чырвонагвардзейцы.

ЦК РСДРП(б) паставіў задачу бальшавікам Беларусі і Зах. фронту — ізаляваць Стаўку і не прапусціць контррэвалюц. войскі на Петраград і Маскву. 30.8(12.9).1917 на аб'яднаным пасяджэнні выканкома Мінскага Савета і к-та Зах. фронту створаны Часовы рэвалюц. к-т Зах. фронту, які абвясціў сябе адзінай уладай у р-не Зах. фронту. К-т наладзіў сувязь з Петраградам і Масквою, Саветамі ў тыле і салдацкімі к-тамі на фронце, каардынаваў дзейнасць рэвалюц. арг-цый з мэтай ізаляцыі Стаўкі; узяў пад кантроль пошту, тэлеграф, друкарні, выдавецтвы, установы, наглядаў за дзейнасцю штаба Зах. фронту і генералітэту. Без ведама к-та не дазвалялася перакідваць войскі з фронту, мяняць маршруты вайсковых эшалонаў. Прадстаўнікі к-та дзейнічалі ў Гомелі, Жлобіне, Оршы, Бабруйску. Пры Саветах рабочых і салдацкіх дэп. і ў вайсковых гарнізонах на Беларусі для барацьбы з К. ствараліся бюро бяспекі. У Мінску барацьбу з карнілаўшчынай узначаліў М. В. Фрунзе, які кіраваў чырвонагвардз. атрадамі і рэвалюц. часцямі, гарадской міліцыяй. Пры Аршанскім Савеце дзейнічала бюро па барацьбе з К. Бальшавікамі Оршы кіравау П. М. Лепяшынскі. Дзейнасць бальшавікоў Гомельшчыны узначаліў Палескі к-т РСДРП(б), прадстаўнікі якога ўвайшлі ў склад надзвычайнай пяцёркі па барацьбе з К. пры Гомельскім Савеце. Пры Віцебскім Савеце працавала ваен.-рэвалюц. бюро. Ствараліся чырвонагвардз. атрады і баявыя дружыны. Паводле пастановы сходу прадстаўнікоў прафсаюзаў і фабр.-зав. к-таў Мінска (30 жн.) арганізаваны рабочыя баявыя дружыны (больш за 1000 чал.), 2 атрады з чыгуначнікаў (да 300 чал.). Зводны атрад Чырв. гвардыі (да 800 чал.) і створаны ў в. Кайкава Мінскага пав. чырвонагвардз. атрад з 500 сялян і салдатаў разброілі каля Мінска некалькі эшалонаў карнілаўцаў. Вайск. эшалоны карнілаўцаў з Паўд.-Зах. фронту затрымлівалі ў Гомелі і Оршы. майстэрнях (кіраўнік сакратар парт. арг-цыі І. М. Якубаў, 300 чал.) і на прадпрыемствах Гомеля, прадухілілі мяцеж, які рыхтавау стаўленік Карнілава ген. Кошыт; паслалі атрад на дапамогу бальшавікам Магілёва; затрымалі 30 эшалонаў карнілаўцаў на чыг. ст. Калінкавічы, на лініі Гомель — Жлобін і інш. Працоўныя Оршы перашкодзілі Карнілаву наладзіць праз Оршу сувязь з Масквою, перапынілі пасылку харчу ў Магілёў; арганізавалі ўводны атрад з салдатаў і рабочых (1000 штыкоў, 8 бамбамётаў). Смаленскі і Віцебскі Саветы прыслалі ў Оршу 1400 пехацінцаў і 2 кулямётныя роты. Падпарадкаваная Аршанскаму Савету каманда матацыклістаў (амаль поўнасцю з бальшавікоў) вяла разведку і несла службу сувязі ад Оршы да Магілёва. Пад кантролем Савета знаходзіліся чыг. ст. Лотва і Шклоў, дзе затрыманы эшалоны карнілаўцаў, якія накіроўваліся ў Стаўку. Северскі драгунскі полк (старшыня палкавога салдацкага к-та С. М. Будзённы) разам з Ніжагародскім драгунскім палком разброіў у Оршы некалькі эшалонаў «дзікай дывізіі», якія накіроўваліся на Петраград і Маскву. Рэчыцкі чырвонагвардз. атрад (150 чал.) пад кіраўніцтвам бальшавіка Л. Міцкевіча накіраваны ў Жлобін для барацьбы з К. У выніку агітацыі бальшавікоў салдаты Мінскага, Віцебскага, Рэчыцкага і інш. гарнізонаў перайшлі на бок рэвалюцыі. Затрыманыя ў Віцебску 30 жн. эшалоны тэкінцаў і драгунаў далучыліся да часцей гарнізона. У Магілёве Карнілаў абвясціў асадное становішча. Аднак пад уплывам агітацыі бальшавікоў Георгіеўскі батальён, карнілаўскі ўдарны полк і інш. часці адмовіліся падтрымліваць мяцежнікаў. Шырокія салдацкія масы не падтрымалі К. Пачаліся перавыбары і бальшавізацыя салдацкіх к-таў. Да 30.8(12.9).1917 К. разгромлена. Ген. Крымаў застрэліўся. У Стаўцы і штабах франтоў арыштаваны ген. Карнілаў, Лукомскі, Маркаў, Романоўскі, Дзянікін, Эрдэлі і інш. і зняволены на ахову ў мяст. Быхаве. 31 жн. (13 вер.) афіцыйна абвешчана пра ліквідацыю К. Пад уплывам рэвалюц. ўздыму ў час барацьбы з К. ажывілася дзейнасць Саветаў. 31.8(13.9).1917 Петраградскі, 5(18).9.1917 Маскоўскі Саветы прынялі бальшавіцкія рэзалюцыі аб уладзе. Пачалася масавая бальшавізацыя Саветаў.

Літ.: Ленін У. І. Пачатак банапартызму.— Чуткі аб змове.— У Цэнтральны камітэт РСДРП.— Аб кампрамісах.— Праект рэзалюцыі аб сучасным палітычным моманце.— Пагражаючая катастрофа і як з ёю змагацца, Тв., т. 25 (Полн. собр. соч., т. 34); Революционное движение в России в августе 1917 г. Разгром корниловского мятежа, М., 1959 (Великая Октябрьская социалистическая революция. Документы и материалы); Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Документы и материалы, т. 1, Мн., 1957; Холпов А. Красная гвардия Белоруссии в борьбе за власть Советов (март 1917 — март 1918 гг.), Мн., 1965; Ивашин В. Г. Борьба большевиков Белоруссии против корниловщины, Мн., 1962; гл. таксама літ. пры арт. *Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя*. *У. Г. Івашын.*

КАРНО (Carnot) Нікала Леанар Садзі (1.6.1796—24.8.1832), франц. фізік і інжынер, адзін з заснавальнікаў тэрмадынамікі. Вызначыў (1824) заканамернасці работы цеплавых машын (гл. *Карно цыкл*) і ўпершыню сфармуляваў другі пачатак тэрмадынамікі.

Тв.: Рус. пер.— Размышления о движущей силе огня и о машинах, способных развивать эту силу, М.— Л., 1923.

КАРНО ЦЫКЛ, абарачальны цыкл тэрмадынамічных працэсаў. Прапанаваны С. *Карно* ў 1824.

К. ц. складаецца з 4 працэсаў (гл. рыс.): *AB* — ізатэрмічнае расшырэнне пры т-ры T_1 з паглынаннем цяпла Q_1; *BC* — адыябатычнае ахаладжэнне да т-ры T_2; *CD* — ізатэрмічнае сціскание пры т-ры T_2 з вылучэннем цяпла Q_2; *DA* — адыябатычнае нагнетание да т-ры T_1. Тэрмічны ккд η для К. ц. роўны $\eta = 1 - Q_2/Q_1 = 1 - T_2/T_1$. Пры зададзеных T_1 і T_2 η не залежыць ад уласцівасцей рабочага цела (тэарэма Карно) і больш за ккд іншых цеплавых цыклаў.



Цыкл Карно ў каардынатах *p*, *v* (ціск, аб'ём).

КАРНЫЯ АПЕРАЦЫІ нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну 1941—45, сукупнасць акцый рэпрэсіўнага, ваеннага, эканамічнага і палітычнага характару, каб задушыць партыз. рух, знішчыць і заняволіць савецкі народ, рабаваць маёмасць. К. а.— неад'емная частка ням.-фаш. *акупацыйнага рэжыму*, адзін з асн. сродкаў усталявання і захавання т. зв. «новага парадку». Ажыццяўляліся ваен., ахоўнымі, паліцэйскімі і спец. падраздзяленнямі гітлераўцаў. На тэр. БССР ням.-фаш. захопнікі праводзілі К. а. з першых дзён акупацыі. У ліп. 1941 паліцэйскі полк «Цэнтр» правёў К. а. ў Белавежскай пушчы і сумежных раёнах, у жн. 1941 221-я і 286-я ахоўныя дывізіі — у р-не Іванцэвіч і Лепеля, а 1-я пяхотная матарызаваная брыгада СС — на Палессі. Каб узмацніць барацьбу з партыз. рухам, нач. штаба вярх. галоўнакамандавання ўзбр. сіл В. Кейтэль аддаў спец. загад пра задушэнне «камуністычнага паўстанцкага руху», у якім патрабаваў самай жорсткай расправы з патрыётамі. 25.10.1941 штаб гал. камандавання сухап. войск фаш. Германіі выдаў «Дырэктыву па барацьбе з партызанамі», дзе падагуліў вопыт барацьбы з партыз. рухам і даў указанні па тактыцы т. зв. «ўцівілізавання» цывільнага насельніцтва, звяртаючы асаблівую ўвагу на арганізацыю і правядзенне буйных К. а. 16.4.1942 камандуючы ахоўных войск і нач. тылавога раёна групы армій «Цэнтр» Шэнкендорф, які меў у сваім распараджэнні 4 ахоўныя дывізіі, 2 брыгады СС, 11 артыл. батарэй, 229 пяхотных рот, 12 танказнішчальных рот, 9 рот цяжкай пяхотнай зброі, папрасіў дадаткова 13 ахоўных батальёнаў і 2 дывізіі для правядзення буйных К. а. У вер. 1942 Гітлер, каб узмацніць барацьбу з партызанамі, усклаў агульнае кіраўніцтва па барацьбе з партыз. рухам на акупаваных тэрыторыях на рэйхсфюрэра СС Гімлера, у аператыўных р-нах — на нач. штаба вярх. галоўнакамандавання ўзброеных сіл Кейтэля. У кастр. 1942 Гімлер прызначыў нач. СС і паліцыі ў Расіі групенфюрэра СС Бах-Залеўскага сваім упаўнаважаным па барацьбе з партызанамі на Беларусі і перадаў у яго распараджэнне матарызаваную брыгаду СС, 2 паліцэйскія палкі, 3 ахоўныя батальёны, 2 батарэі процітанкавых гармат, танкавую роту, а таксама ахоўныя часці і розныя «добраахвотныя» фарміраванні фаш. сатэлітаў. Акрамя таго, у кастр. 1942 на Беларусь дадаткова былі перакінуты 19 вучэбных батальёнаў вермахта і вучэбныя часці ВПС, якія прыцягваліся да ўдзелу ў К. а. Да вясны 1944 на Беларусі К. а. супраць партызанаў і мірнага насельніцтва вялі 9 дывізій (201, 203, 221, 281 і 286-я ахоўныя, 707-я пяхотная, 52-я вучэбна-палявая спец. прызначэння, 390-я і 391-я вучэбна-палявыя), больш за 100 ахоўных батальёнаў і шмат спец. падраздзяленняў. Акрамя іх, у К. а. удзельнічалі падраздзяленні дывізій аператыўнага рэзерву групы армій «Цэнтр». Да вясны 1942 К. а. мелі спарадычны характар. У чэрв. 1942 Шэнкендорф распрацаваў план 16 К. а. у тылавым р-не групы армій «Цэнтр». З восені 1942 Бах-Залеўскі і Шэнкендорф пачалі каардынаваць свае дзеянні і сістэматычна планавалі і ажыццяўлялі буйныя К. а. па ўсёй тэр. Беларусі з удзелам часцей паліцыі, СС і вермахта. За гады часовай акупацыі ням.-фаш. захопнікі правялі не меш як 100 К. а. (гл. табл.), прычынілі вялікія страты нар. гасп. рэспублікі і яе насельніцтву. Карнікі знішчылі ці вывезлі ў Германію сотні тысяч людзей, ажыццяўлялі татальнае рабаванне харчовых і сыравінных запасаў, жывёлы і маёмасці. Былі спалены тысячы вёсак, многія раёны ператвораны ў «зоны пустыні».

Карныя аперацыі на тэрыторыі БССР у 1942—44

Назва аперацыі або яе нумар	Час	Месца
«Рыга» (Riga)	май 1942	на Пн і ПнЗ ад Шацка
«Аляксандрава» (Alexandrowo)	чэрв. 1942	на Пд ад Мінска
«Майскі жук» (Maikäfer)	чэрв. — ліп. 1942	на Пн ад Кіраўска
№ 9	чэрв. — ліп. 1942	на З ад Барысава
№ 10	чэрв. — ліп. 1942	вакол Багушэўска
№ 2	ліп. 1942	на Пн ад Гомеля
№ 5	ліп. 1942	на ПнУ ад Бабруйска
№ 11	ліп. 1942	на З ад Магілёва
№ 12	ліп. 1942	на Пн ад ст. Дрэтунь
№ 13	ліп. 1942	на Пд ад ст. Дрэтунь
№ 40 «Страла» (Pfeil)	ліп. 1942	на У ад Полацка
№ 6	ліп. 1942	на У і ПдУ ад Слуцка
№ 14	ліп. 1942	на Пн ад Полацка
№ 8	ліп. 1942	на Пн ад Бераэіна
№ 19	ліп. 1942	на Пд ад Гомеля
№ 26	ліп. — жн. 1942	вакол Чавусаў
«Арол» (Adler)	ліп. — жн. 1942	на Пн ад Клічава
№ 38	ліп. — жн. 1942	Чэрыкаў — Слаўгарад — Краснаполле
№ 7	жн. 1942	на ПдЗ ад Бабруйска
№ 32 «Пантэра» (Panther)	жн. 1942	на Пн ад Расонаў
«Грыф» (Greif)	жн. 1942	на Пн ад Оршы
«Дружба» (Freundschaft)	жн. 1942	Пд Магілёўскай вобл.

Працяг

Назва аперацыі або яе нумар	Час	Месца
«Лютцаў» (Lützau)	жн. 1942	Пд Магілёўскай вобл.
«Гольфельд» (Holfeld)	жн. 1942	Пд Магілёўскай вобл.
«Балотная ліхаманка — Поўнач» (Sumpffieber — Nord, Treuenfeld I)	жн. 1942	вакол воз. Домжарыцкага
«Балотная ліхаманка — Поўнач» (Binz)	жн. 1942	на У ад Вілейкі
«Балотная ліхаманка — Поўнач» (Treuenfeld II)	жн. 1942	на Пн ад Жодзіна
«Балотная ліхаманка — Поўнач» (Barkholdt)	жн. 1942	на ПнЗ ад Лагойска
«Балотная ліхаманка — Поўнач» (Treuenfeld III)	вер. 1942	на У ад Дзяржынска
«Балотная ліхаманка — Захад» (Sumpffieber — West)	вер. 1942	на З і Пд ад Баранавіч
«Балотная ліхаманка — Паўднёвы Захад» (Sumpffieber — Süd — West)	вер. 1942	на Пн і Пд ад Івацэвіч
«Міхель» (Michel)	жн. — вер. 1942	на Пн ад Бярозы
«Рысь» (Luchs)	вер. 1942	на У ад Лепеля
«Брэслаў» (Breslau)	вер. 1942	на ПнУ ад Оршы
«Сава» (Eule)	вер. 1942	на З ад Шклова
«Трохвугольнік» (Dreieck)	вер. 1942	на ПдЗ ад Кобрына
«Паўночнае мора» (Nordsee)	вер. 1942	на Пд ад Магілёва
«Маланка» (Blitz)	вер.— кастр. 1942	на ПнЗ ад Віцебска
«Хатэмля-Аргуні» (Chozemlja-Arguny)	кастр. 1942	на ПдУ ад Віцебска
«Рэгата» (Regatta)	кастр. 1942	на Пд ад Горак
«Карлсбад» (Karlsbad)	кастр. 1942	на ПдЗ ад Талачына
«Нюрнберг» (Nürnberg)	ліст. 1942	на ПнЗ ад Глыбокага
«Карл» (Karl)	ліст. 1942	на Пн ад Барысава
«Альберт I» (Albert I)	ліст. 1942	на ПнУ ад Слуцка
«Альберт II»	ліст. 1942	на Пд ад Рудзенска
«Фрыда» (Frida)	ліст. 1942	на Пд ад Барысава
«Гамбург» (Hamburg)	снеж. 1942 — студз. 1943	на Пд ад Слоніма
«Альтона» (Altona)	снеж. 1942	на Пн ад Косава
«Сонцаварот» (Sonnenwende)	снеж. 1942	на Пд ад Блынічі
«Мюнхен» (München)	снеж. 1942	на Пн ад Радашковіч
«Клетка малпы» (Affenkäfig)	снеж. 1942— студз. 1943	на ПнУ ад Полацка
«Лясная зіма» (Waldwinter)	снеж. 1942 — студз. 1943	на У і ПнУ ад Полацка

Працяг

Назва аперацыі або яе нумар	Час	Месца
«Якаб» (Jakob)	студз. 1943	на Пн ад Уады
«Мокры трохвугольнік» (Nassadreieck)	студз. 1943	на У ад Мыра
«Дыямант» (Diamant)	студз. 1943	на ПнЗ ад Віцебска
«Франц» (Franz)	студз. 1943	на Пн ад Асіповіч
«Заяц-бляк» (Schneehase)	студз. — люты 1943	на З і ПнЗ ад Расоны
«Свята ўраджаю I» (Erntefest 1)	студз. — люты 1943	на ПдУ ад Мінска
«Свята ўраджаю II»	студз. — люты 1943	на ПдЗ ад Мінска
«Урсула» (Ursula)	люты 1943	на Пн ад Ратчова
«Шаравая маланка» (Kugelblitz)	люты — сак. 1943	на Пн і ПнУ ад Гарадка
«Зімовая казка» (Winterzauber)	люты — сак. 1943	на Пд і ПдЗ ад Асвеі
«Люты», «Горнунг» (Hornung)	люты — сак. 1943	на Пд і ПдЗ ад Слуцка
«Русалка» (Nixe)	люты — сак. 1943	на Пн ад Жыткавіч
«Цёплы вецер» (Föhn)	сак. 1943	на ПнУ ад Лунінца
«Манылы» (Manyly)	сак. 1943	на Пн ад Мінска
«Дырлевангер» (Dirlewanger)	сак. 1943	вакол Лагойска
«Грамавы кліп» I (Donnerkeil 1)	сак. 1943	на Пд ад Полацка
«Грамавы кліп» II	сак. — крас. 1943	на ПдУ ад Полацка
«Сарві-галава I» (Draufgänger I)	крас. 1943	на У ад Маладзечна
«Сарві-галава II»	май 1943	на З ад воз. Палік
«Майская навальніца» (Maigewitter)	май 1943	на ПнЗ ад Сурвіна
«Веснавы заказ» (Frühlingsbestellung)	май 1943	на Пд ад Полацка
«Котбус» (Cottbus)	май — чэрв. 1943	Бягомль — Барысаў — Лепель
«Веснавы карагод» (Frühlingsreigen)	май — чэрв. 1943	на Пн ад Рудні Смаленскай вобл.
«Пасадка на сёмуху» (Pfingstreise)	чэрв. 1943	на У ад Магілёва
«Дондж на сёмуху» (Pfingstregen)	чэрв. 1943	Гарадок — Сураж
«Узорны маёнтак» (Mustergut)	ліп. 1943	на У ад Магілёва
«Гюнтэр» (Günter)	ліп. 1943	на Пн ад Мінска
«Герман» (Hermann)	ліп. — жн. 1943	на ПнЗ ад Дзяржынска
«Іваноў» (Iwanov)	жн. 1943	на У і ПдУ ад Бераэіна
«Лета» (Sommer)	жн. 1943	на ПдЗ ад воз. Нарач
«Фрыц» (Fritz)	вер.— кастр. 1943	на Пд ад Браслава
«Асеннее паляванне» (Herbstjagd)	кастр. 1943	на Пн ад Бабруйска
«Генрых» (Heinrich)	кастр. — ліст. 1943	на ПнУ ад Полацка

Працяг

Назва аперацыі або яе нумар	Час	Месца
«Бакас» (Schnepfe)	ліст. 1943	на Пн ад Віцебска
«Ота» (Otto)	снеж. 1943— студз. 1944	Себеж — Дрыса — Полацк
«Лівень» (Regenschauer)	крас. 1944	вакол Ушачаў
«Веснавое свята» (Frühlingsfest)	крас. — май 1944	вакол Лепеля
«Баклан» (Kormoran)	май — чэрв. 1944	на З ад Лепеля
«Стракаты дзяцел» (Buntspecht)	май 1944	Крупскі р-н Мінскай вобл.

Заўвага. У гэты пералік не ўвайшлі К. а. без умоўнай назвы або нумара ці паўтораныя пад адной назвай ці нумарам, К. а. ў гарадах («Чароўная флейта» ў Мінску, «Слуцк» і інш.), а таксама тыя, назву якіх ці нумар, дату і месца правядзення не ўдалося высветліць па дакументах.

Літ.: Гл. пры арт. *Акупацыйны рэжым. В. С. Лазебнікай, У. С. Пасэ, А. А. Фактаровіч.* Мінск.

КАРНЯЙЧУК Аляксандр Еўдакімавіч [н. 12 (25).5.1905, ст. Хрысціпаўка Уманскага пав. Кіеўскай губ.], украінскі савецкі драматург і грамадскі дзеяч. Герой Сац. Працы (1967). Акад. АН СССР (1943), АН УССР (1939). Чл. КПСС з 1940. З сям'і чыгуначніка. Скончыў Кіеўскі ін-т нар. асветы (1929). Дэбютаваў апавяд. «Ён быў вялікі» (1925) пра бессмяротнасць У. І. Леніна. Першыя драм. творы К. («На грані», 1930; «Каменны востраў», 1931; «Штурм», паст. 1931), скіраваныя супраць тэорыі «чыстага мастацтва», выкрывалі бурж. нацыяналізм, сцвярджалі новую сацыяліст. культуру і мастацтва. Этапным творам з'явілася гісторыка-рэвалюц. драма «Гібель эскадры» (1934). Драматызм дзеяння, трапны дыялог, каларытныя характары дзейных асоб — асн. якасці п'есы (2-я прэмія на Усесаюзным конкурсе 1933). Фарміраванне новай сав. інтэлігенцыі, адданай партыі і народу, адлюстравана ў п'есе «Платон Крэчат» (1935, Дзярж. прэмія СССР 1941), шляхі ўкр. народа да вялікай рэвалюц. праўды, да Сав. улады, дружба з рус. народам — у гісторыка-сац. драме «Праўда» (1937). У ёй упершыню ва ўкр. драматургіі створаны вобраз У. І. Леніна. Вытокі дружбы ўкр. і рус. народаў глыбока раскрыты ў гераічнай драме «Багдан Хмяльніцкі» (1939, Дзярж. прэмія СССР 1941). Камедыя «У стэпах Украіны» (1941, Дзярж. прэмія СССР 1942) пра актуальныя праблемы калгаснага буд-ва. Пафас адмаўлення старых метадаў вядзення вайны, сцвярджэнне перадавой сав. ваен. навукі ў п'есе «Фронт» (1942, Дзярж. прэмія СССР 1943). Тэматыка пасляваен. творчасці К.— адбудова калгасаў («Прыязджайце ў Званкавое», 1947), гераічныя будні шахцёраў Данбаса («Макар Дубрава», 1948, Дзярж. прэмія СССР 1949), жыццё і духоўны рост працаўнікоў вёскі («Калінавы гай», 1950, Дзярж. прэмія СССР 1951), перадавыя метады парт. і гасп. кіраўніцтва («Крылы», 1954) і інш. Аўтар камедый «Над Дняпром» (1960), «Чаму ўсміхаліся зоры» (1957), п'ес пра сучасніка «Старонка дзённіка» (1964), «Расплата» (1966), «Мае сябры» (1967), «Памяць сэрца» (1969), кн. публіцыстыкі «Разам з народам» (1950), прац пра Т. Шаўчэнку, І. Франка, Л. Украінку, М. Горкага і інш. П'есы К. перакладаліся на бел. мову і ставіліся: Бел. т-рам імя Я. Купалы — «Платон Крэчат» (1936), «У стэпах Украіны» (1941), «Фронт» (1942), «Калінавы гай» (1950), «Макар Дубрава» (1952), «Крылы» (1955), «Памяць сэрца» (1970), т-рам імя Я. Коласа — «Гібель эскадры» (1935), «Фронт» (1942), «Калінавы гай» (1950), «Платон Крэчат» (1956). На XIX, XX, XXII—XXIV з'ездах КПСС выбіраўся чл. ЦК, на XVI—XIX і XXI—XXIV з'ездах КПУ — чл. ЦК КП Украіны. Дэп. Вярх. Савета СССР 1—8-га скл., Вярх. Савета УССР 1—8-га скл., старшыня Вярх. Савета УССР 2, 3, 5—8-га скл. Чл. Суса. Савета Міру (з 1950) і яго прэзідыума, нам. старшыні Суса. Савета Міру (з 1958). Міжнар. Ленінская прэмія «За ўмацаванне міру паміж народамі» (1960). Узнаг. 5 ордэнамі Леніна, ордэнам Кастр. Рэв., 2 інш. ордэнамі, медалямі.



Тв.: Твори, т. 1—5, Київ, 1966—68; П'єси, Київ, 1967; рус. пер.— Соч., т. 1—3, М., 1956; Пьесы, М., 1961; Пьесы, М., 1967.

Літ.: Дузь І. Олександр Корнійчук. Літ. портрет, Київ, 1963; Кобилецький Ю. Драматург і час. Творчість Олександра Корнійчука, Київ, 1965; Письменники Радянської України. Біобібліогр. довідник, Київ, 1966. *К. Р. Хромчанка.* Мінск.

КАРО (Corot) Каміль (16.7.1796, Парыж — 22.2.1875), французскі жывапісец, майстар лірычнага пейзажу. Вучыўся ў пейзажыстаў акад. кірунку. У ранніх творах («Раніца ў Венецыі», 1834; «Шартрскі сабор», 1830) К. імкнуўся да дакладнай перадачы своеасаблівасці мясцовасці, празрыстасці паветра, яркасці сонечнага святла. Разам з вялікімі гістар. пейзажамі, навеянымі акад. традыцыямі («Гамер і пастухі», 1845), К. стварыў праўдзівыя, поўныя лірызму карціны італьян. і франц. прыроды. Познім пейзажам К. ўласцівыя тонкая паэт. натхнёнасць, серабрыста-жамчужная гама, багацце валёраў («Воз сена», «Парыў ветру», каля 1865—70; «Жанчына з каровай», каля 1860—70). Аўтар інтымна-лірычных жаночых партрэтаў, рысункаў, афортаў.



Літ.: Гайдукевич Е. М. (сост.). Коро — художник, человек, пер. с франц., М., 1963.

КАРО́БКА ПЕРАДА́Ч (каробка скорасцей), механізм для перадачы і ператварэння велічыні і кірунку вярчальнага моманту і скорасці ў транспартных машынах, станках і г. д.

К. п. падзяляюцца: ад спосабу ператварэння вярчальнага моманту — на механічныя, гідраўлічныя, гідрамеханічныя і электрычныя; ад спосабу рэгулявання — на рэгуляваныя, аўтаматызаваныя і аўтаматычныя; ступеньчатыя, бесперапынна-ступеньчатыя і бесступеньчатыя. Найб. пашыраны мех. ступеньчатыя і гідрамеханічныя бесперапынна-ступеньчатыя. У бесступеньчатых скорасць вменьваецца бесперапынна ў пэўным інтэрвале, часта аўтаматычна, залежна ад нагрузкі на вядзёны элемент; у ступеньчатых — дыскрэтна, залежна ад уключэння той ці іншай перадачы.

Літ.: Петров В. А. Автоматическое управление бесступенчатых передач самоходных машин. Теория и техника. М., 1968; Антонов А. С. Силовые передачи колесных и гусеничных машин. Л., 1967. *М. С. Лебедзеў.* Мінск.

КАРОБКІН Васіль Іванавіч [н. 17(30).6.1904, станіца Мінгрэльская Тэмрукскага аддзела Кубанскай вобл.], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Баранавіцкай вобл. ў Айч. вайну. З рабочых. Чл. КПСС з 1928. З 1918 батрак, рабочы. У 1926—41 у Чырв. Арміі. З чэрв. 1941 на фронце. У партызанах з жн. 1942 — сувязны атрада, камандзір узвода; з ліп. 1943 камісар *партызанскай брыгады № 18*, з студз. 1944 камандзір *партызанскай брыгады № 19* Баранавіцкай вобл. Пасля вайны на рабоце ў гандлёвых арг-цыях Даўгавы, Ваўкавыска, Полацка, Мінска. Узнаг. ордэнам Чырв. Зоркі, медалямі. Жыве ў Мінску.

КАРО́БЧЫНА, вёска ў Чырванагорскім с/с Мсціслаўскага р-на Магілёўскай вобл., на р. Віхра. Цэнтр калгаса «1 Мая». За 2 *км* на У ад Мсціслава, 105 *км* ад Магілёва, 22 *км* ад чыг. ст. Ходасы. 237 ж., двароў 82 (1971). Пач. школа, клуб, аддз. сувязі, магазін. У 1943 вёску часткова спалілі нямец.-фаш. захопнікі. Помнік 120 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

КАРО́БЧЫЦЫ, вёска ў Гродзенскім р-не, на р. Ласосна. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Гродзенскі». За 6 *км* на ПдЗ ад Гродна. 434 ж., гасп. 110 (1971). Павільён быт. абслугоўвання. Пач. школа, клуб, б-ка, дзіцячы сад, вет. пункт, сталовая, аддз. сувязі, магазін. За 4,5 *км* ад К. у 1941 нямец.-фаш. захопнікі стварылі лагер смерці Калбасіна, дзе загубілі каля 18 тыс. чалавек.

КАРО́ВІН Канстанцін Аляксеевіч [23.11(5.12).1861, Масква — 11.9.1939], рускі жывапісец. Вучыўся ў Маск. вучылішчы жывапісу, ваяння і дойлідства (1875—86) у А. Саўрасава і В. Паленава. Акад. Пецярбургскай АМ (з 1905). Чл. аб'яднання «Свет мастацтва», Саюза рус. мастакоў. З 1924 жыў у Парыжы. Выдатны каларыст. Зазнаў значны ўплыў імпрэсіянізму. Сярод жывапісных работ: партрэт Т. С. Любатовіч (1886—87),



«Каля балкона» (1886), «Зімой» (1894), «Парыж. Бульвар капуцынаў» (1906), партрэт Ф. І. Шаляпіна (1911), «Ружы і фіялкі» (1912). Адзін з стваральнікаў новага тыпу тэатр. дэкарацыі, які вызначаецца маляўнічасцю і сцэнічнай выразнасцю («Садко» М. Рымскага-Корсакава, 1906; «Капёк-Гарбунок» Ц. Пуні, 1911 — у Вял. т-ры ў Маскве). У Дзярж. маст. музеі БССР 16 карцін мастака.

Тв.: Константин Коровин вспоминает..., М., 1971.
Літ.: Константин Коровин. М., 1963.

КАРО́ВІН Сяргей Аляксеевіч [7(19).8.1858, Масква — 13(26).10.1908], рускі жывапісец-жанрыст. Блізкі да перасоўнікаў. Брат К. А. *Каровіна*. У 1876—86 вучыўся ў Маск. вучылішчы жывапісу, ваяння і дойлідства (у В. Пярова, А. Саўрасава), дзе выкладаў з 1888. Вучнем К. быў В. К. Бялыніцкі-Біруля. Творы: «У прыёмнай вучылішча» (1883), «Перад пакараннем» (1884), «Салдаты каля калодзежа» (1885), «Чакаюць поезда» (1895); ін. (1900—08) да аповесці М. В. Гогаля «Шынель» і інш. Гал. твор К. «На людзях» (1893) прысвечаны тэме класавай барацьбы на вёсцы. У Дзярж. маст. музеі БССР эскіз карціны «На людзях», эцюды.

Літ.: Суздалев П., С. А. Коровин. Л., 1967.

КАРО́ЗІЯ ў геалогіі (лац. corrosio разъядание), 1) частковае разбурэнне (растварэнне) горных парод ад хім. дзеяння вады і ўтварэнне шчылін, катлавін, пячораў і інш. пустот. Пашырана пераважна ў месцах развіцця лёгкаратваральных парод (гл. *Карст*). 2) Разъяданне і аплаўленне магмай мінералаў і абломкаў горных парод, утвораных раней.

КАРО́ЗІЯ МЕТА́ЛАЎ, разбурэнне паверхні металаў пад уздзеяннем агрэсіўнага асяроддзя — газаў, вільгаці, хім. рэчываў, *блукальных токаў*. Найб. устойлівыя да карозіі золата, плаціна.

Прадукты К. м.— іржа, акаліна, розныя хім. злучэнні. У залежнасці ад механізму разбурэння К. м. падзяляецца на хім. і эл.-хімічную; у залежнасці ад агрэсіўнага асяроддзя — на атмасферную, газавую, глебавую і г. д. Каб павысіць каразійную ўстойлівасць, шырока ўжываюць *ахоўныя пакрыцці*, *легіраванне*, спец. апрацоўку металаў. Гл. таксама *Антыкаразійныя матэрыялы*.

Літ.: Улиг Г. Коррозия металлов, пер. с англ., М., 1968.

КАРО́ЛЬ Рыгор Якаўлевіч (н. 20.10.1922, в. Турок Мазырскага пав. Мінскай губ.), кавалер ордэнаў Славы трох ступеняў. З сялян. Чл. КПСС з 1943. У Чырв. Арміі з 1940. На фронце з 1941. Вызначыўся 19.1.1944 у Калінінскай вобл., разлік яго гарматы знішчыў 2 варожыя станковыя кулямёты і процітанкавую гармату; у жн. 1944 знішчыў 3 станковыя і ручны кулямёты, 6 гармат; у маі 1945 узвод пад камандаваннем К. знішчыў у Берліне бронетранспарцёр, 11 станковых і ручных кулямётаў, 2 мінамётныя батарэі. Жыве ў Гомелі.

КАРО́ЛЬ Сцяпан Георгіевіч [н. 20.11(2.12).1894, мяст. Дварэц Слонімскага пав. Гродзенскай губ.], генерал-лейтэнант авіяцыі (1944). З сялян. Чл. КПСС з 1919. Скончыў Ваен.-паветр. акадэмію імя Жукоўскага (1935), Ваен. акадэмію Ген. штаба (1940). У арміі з 1915, у Чырв. Арміі з лютага 1918. Удзельнік грамадз. вайны на Карэльскім і Каўказскім франтах — ст. авіяматарыст. У 1933—37 камандзір і камісар авіяц. брыгады ў Бел. і Кіеўскай ваен. акругах. У Айч. вайну на Цэнтр., Варонежскім, Сцяпным і 1-м Укр. франтах — камандзір авіяцыйнай дывізіі, знішчальна-авіяц. корпуса. Удзельнік абароны Растова, Новарасійска, Краснадара, Ленінграда, Архангельска. З 1945 нач. ф-та акадэміі. З жн. 1951 у запасе. Узнаг. ордэнам Леніна, 7 інш. ордэнамі, медалямі. Жыве ў Кіеве.



КАРО́ЛЬ Уладзімір Адамавіч [н. 14(27).12.1912, г. Ігумен Мінскай губ.], беларускі савецкі архітэктар і дзярж. дзеяч. Нар. архітэктар СССР (1970), засл. будаўнік БССР (1962). Чл. КПСС з 1940. Скончыў Ленінградскую АМ (1941). Удзельнік Айч. вайны. З 1945 нам. начальніка, з 1951 начальнік Управаўлення па справах архітэктуры пры СМ БССР, з 1955 — старшыня Дзярж. камітэта СМ БССР па справах буд-ва. Удзельнічаў у пасляваенным аднаўленні бел. гарадоў. Работам К. ўласцівыя яснасць планіровачных і арх.-канструктыўных вырашэнняў. Сярод работ у Мінску: праекты планіроўкі і забудовы Ленінскага праспекта і Цэнтр. пл. (1945—48, у аўтарскім калектыве; Дзярж. прэмія БССР 1968), будынак Галоўпаштамта (1950—53), абеліск-помнік воінам Сав. Арміі і партызанам, што загінулі ў Вял. Айч. вайну (1954, з арх. Г. Заборскім, скульптарамі З. Азгурам, А. Бембелем, А. Глебавым, С. Селіханавым), будынак Цэнтр. тэлеграфа (1954—56, з арх. А. Духанам); жылыя дамы ў Мінску, Гомелі, Полацку (1946—48). Удзельнік стварэння генплана і плана рэканструкцыі Мінска (1948—69). Адзін з аўтараў мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой» (1971). Адначасова, з 1947, вядзе пед. работу ў Бел. політэхн. ін-це. Рэдактар бюл. «Строительство и архитектура Белоруссии». Дэпутат Вярх. Савета БССР 4—8-га скліканняў. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Кастр. Рэвалюцыі, 2 інш. ордэнамі, медалямі.



Тв.: Архитектурный облик будущего Минска, Мн., 1953; Планировка и застройка городов Белоруссии, «Жилищное строительство», 1961, № 7; (у саавт.) Минск, М., 1966; Градостроительство и архитектура Советской Белоруссии, «Архитектура СССР», 1967, № 7; (разам з В. Анікіным) Развитие центра Минска, «Архитектура СССР», 1969, № 11; Опыт проектирования и строительства промышленных узлов в Белорусской ССР, «Промышленное строительство», 1970, № 3. *І. В. Электух.* Мінск.

КАРО́МКА, паселішча эпохі мезаліту і, магчыма, канца палеаліту паміж в. Каромка і пас. Дняпроўскі Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл. Адкрыта ў 1893 В. Я. Данілевічам. Пры абследаваннях знойдзены крамянёвыя скрабкі, разцы, скоблі, грубаапрацаваныя сякерападобныя прылады працы, больш за 100 ножападобных пласцін і нуклеўсаў.

Літ.: Поликарпович К. М. Палеолит Верхнего Поднепровья. Мн., 1968, с. 11—12.

КАРО́НА (лац. corona вянец), 1) каштоўны галаўны ўбор, знак улады манарха. 2) Тэрмін, які ўжываецца ў манархічных дзяржавах для абазначэння дзярж. улады.

КАРОСАС Іонас Пятровіч [н. 7(20).3.1912, Вільня], дзеяч рэвалюц. руху ў Зах. Беларусі, журналіст. Засл. дзеяч культуры Літ. ССР (1962). З служачых. Чл. КПСС з 1930. У рэвалюц. руху з 1927. З 1930 сакратар Літ. камуніст. бюро пры Віленскім акр. к-це КПЗБ (з 1931 пры ЦК КПЗБ), рэдактар нелегальных камуніст. газ. «Barikada» («Барыкада»), «Bedievis» («Бязбожнік»), легальнай газ. «Ziniosa» («Паведамленні»), літ.-маст. выданняў, у якіх супрацоўнічалі М. Танк і інш. бел. пісьменнікі. У 1932, 1934—35 зняволены польск. бурж. ўладамі ў турму. У Айч. вайну ў Чырв. Арміі, рэдактар Дзярж. выд. Літ. ССР (у Маскве), газ. «Prawda Wileńska» («Віленская праўда», польск.); у 1944—55 нам. рэдактара газ. «Tiesa» («Праўда», з 1950 ст. выкладчык, заг. кафедры журналістыкі Вільнюскага ун-та. У 1955—61 гал. рэдактар час. «Komunistas» («Камуніст») — органа ЦК КП Літвы. З 1959 старшыня прэзідыума праўлення Саюза журналістаў Літ. ССР і сакратар праўлення Саюза журналістаў СССР, з 1961 гал. рэдактар час. «Mókslas ir gyvėnimas» («Навука і жыццё»). Чл. ЦК КП Літвы (1958—64), чл. Рэвіз. камісіі КП Літвы (з 1966). Аўтар успамінаў і даследаванняў па гісторыі рэвалюц. руху ў Зах. Беларусі і на Віленшчыне, у т. л. «Гавораць камяні Вільнюса» (1963). Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі.

КАРО́СТА, заразная хвароба скуры чалавека і жывёлы, узбуджальнік якой *кароставыя кляшчы*.

У чалавека ўзбуджальнік К. кляшчы Acarus siro. Крыніца інфекцыі — хворы на К. чалавек, яго адзенне, рэчы, радзей свойскія жывёлы. Спрыяюць пашырэнню К. антыгігіенічныя бытавыя ўмовы, скучанасць, голад. Прыкметы: моцны сверб скуры, асабліва ноччу, кароставыя хады ў скуры, дробныя пухірковыя высыпкі на скуры паміж пальцамі, на локцевых суставах, тулаве, ягадзіцах і інш. Ускладненне — піёдэрмія. Лячэнне: серная і серна-дзягцярная мазі, растворы гіпасульфіту і салянай к-ты і інш. Прафілактыка: выяўленне, ізаляцыя, лячэнне хворых і дэзінфекцыя іх рэчаў, агляд асоб, якія былі ў кантакце з хворымі. Трапляецца ў БССР спарадычна (адзінкавыя выпадкі).

На К. хварэюць усе свойскія жывёлы. Узбуджальнікі — кароставыя кляшчы 3 родаў: свербуны (Acarus), наскурнікі (Psoroptes) і скураеды (Chorioptes). Хворыя жывёлы трацяць спакой, адчуваюць моцны сверб, знясільваюцца, у іх выпадае поўсць, у цяжкіх выпадках жывёла гіне. К. распаўсюджваецца больш за ўсё ў асенне-зімовы і вясновы перыяды. Свербуны жывуць пераважна ў глыбокіх слаях эпідэрмісу на галаве, шыі, грудзях; наскурнікі — у месцах з доўгімі валасамі; скураеды пашкоджваюць канечнасці жывёлы. Прафілактыка і меры барацьбы: ізаляцыя хворых жы-

вёл, дэзінфекцыя памяшканняў і прадметаў догляду, купанне (авечак) у процікаросных растворах, лячэнне (коней) у газакамерах, хім. апрацоўка скуры (асабліва эфектыўны раствор хларафосу). На Беларусі К. с.-г. жывёл як эпізаотыя ліквідавана.

Літ.: Демьянович М. П. Чесотка, М., 1946; Павлов С. Т. Кожные и венерические болезни, 2 изд., Л., 1969; Иванчиков М. Ф. Чесотка сельскохозяйственных животных, М.— Л., 1951.

А. П. Комаў, В. І. Карагін. Мінск.

КАРОСТАВЫЯ КЛЯШЧЫ, зборная група членістаногіх атр. акарыформных. У яе саставе прадстаўнікі сям. Acaridae, Psoroptidae, Epidermoptidae, Cytoditidae, Demodicidae. Каля 200 відаў. Нападаюць на ўсе віды вышэйшых пазваночных, а таксама на чалавека.



Кароставы клешч Acarus siro.

Памеры 0,1—1 *мм*. Жывуць у верхніх слаях і на паверхні скурнага покрыва, у вушных ракавінах, валасяных цыбулінах, тлушчавых залозах, лімфатычных вуалах, у дыхальных шляхах. Жывяцца сокамі і клеткамі гаспадара. Адкладваюць яйцы ці нараджаюць лічынак. Дарослыя кляшчы жывуць пераважна 1,5—3 месяцы (за гэты час самка дае 40—90 патомкаў). Распаўсюджваюцца праз кантакт хворага са здаровым. Выклікаюць *кароету* і агульнае захворванне арганізма гаспадара (малакроўе, схуднение), часам гібель.

Літ.: Дубинин В. В. Чесоточные клещи, их биология, вред в сельском хозяйстве, меры профилактики и борьбы с ними, М., 1954.

Р. С. Чабатароў. Мінск.

КАРОСЦІНКА, рака, левы прыток пратокі Старая Убарць (бас. Прыпяці). Даўж. 22 *км*. Цячэ ў Лельчыцкім р-не Гомельскай вобл. Ад в. Каросцін да вусця каналізавана. Вадазбор (186 *км*²) — плоская, забалочаная, моцна аблесеная раўніна. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 0,7 *м*³/*сек*. К.— водапрыёмнік пры асушэнні балотаў.

КАРОТКАВІЧЫ, вёска ў Жлобінскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Радзіма». За 28 *км* на ПдЗ ад Жлобіна, 111 *км* ад Гомеля, 8 *км* ад чыг. ст. Мормаль, на аўтамаб. дарозе, якая злучае вёску з Жлобінам. 943 ж., двароў 287 (1971). Майстэрня быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. У снеж. 1943 вёску часткова спалілі нямец.-фаш. захопнікі, загубілі 326 мірных жыхароў (паводле ўдакладненых звестак). Помнік на брацкай магіле 636 сав. воінаў і 5 партызанаў Айч. вайны.

КАРОТКАЕ ЗАМЫКАННЕ, злучэнне токаправодных частак эл. ланцуга праз малое (блізкае да нуля) супраціўленне, што парушае работу эл. сістэмы.

У залежнасці ад колькасці замкнёных фаз (полюсаў) К. з. можа быць трохфазнае, двухфазнае (двухполюснае) і аднафазнае (аднаполюснае). Віды К. з.: міжвітковае — злучэнне накаратка аднаго або некалькіх вітко́ў абмоткі эл. апарата ці эл. машыны; на зямлю (корпус) — злучэнне правадніко́ў эл. установак з прадметамі, што маюць нулявы патэнцыял; перамежнае — пачаргова ўзнікае і знікае (напр., паміж правадамі, якія разгойдваюцца). Прычынай К. з. звычайна бывае парушэнне ізаляцыі правадо́ў або выпадковае злучэнне неізаляваных правадніко́ў паміж сабою ці праз электраправодны матэрыял. К. з.— небяспечная з'ява для людзей і эл. установак. Яно вядзе да рэзкага павелічэння току (да дзесяткаў і соцень тысяч а), выклікае празмернае награвание правадо́ў і апаратаў; можа прывесці да пажару ці да мех. пашкоджання эл. абсталявання. Суправаджаецца рэзкім падзеннем напружання ў сетцы, ад чаго мігаюць светлавы паток лямпаў, спыняюцца электрарухавікі і інш. Каб папярэдзіць К. з., у эл. ланцугах прадугледжваецца *рэлейная ахова*, устанаўліваюцца *засцерагальнікі* электрычныя, масляныя і паветраныя выключальнікі, *ахоўныя электрычныя аўтаматы*.

Літ.: Касаткин А. С. Электротехника. 2 изд., М., 1969; Ульянов С. А. Короткие замыкания в электрических системах, 3 изд., М.— Л., 1963; Маркович И. М. Токи короткого замыкания и устойчивость параллельной работы электрических систем, М.— Л., 1947.

КАРОТКАТЭРМІНОВЫ КРЭДЫТ, гл. ў арт. *Крэдыт*.

КАРОТКАЯ Валянціна Пракопаўна (н. 5.9.1924, в. Вугалеўшчына Талачынскага р-на Аршанскай акр.), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1958). Чл. КПСС з 1959. У 1944—50 калгасніца калгаса «Чырвоны сцяг» Талачынскага р-на Віцебскай вобл. З 1953, звеняявая па вырошчванні лёну калгаса «XVIII партз'езд» Талачынскага р-на. Дэп. Вярх. Савета СССР 5–6-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, медалямі.



КАРОТКІН Сямён Міхайлавіч [2(15).3.1903, в. Барсукі Аршанскага пав. Магілёўскай губ.— 6.10.1942], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Віцебскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1928. Скончыў Камуністычны ін-т журналістыкі ў Мінску (1934). З 1929 на сав., парт. і журналісцкай рабоце. З 1939 у Чырв. Арміі, удзельнік сав.-фінляндскай вайны 1939—40. У 1940—41 заг. аддзела, потым сакратар Сіроцінскага райкома КП(б)Б Віцебскай вобл. У партызанах з сак. 1942, з чэрв. 1942 камандзір партыз. брыгады імя Дзяржынскага. Пасля гібелі К. ў авіякатастрофе брыгадзе прысвоена яго імя (гл. *Партызанская брыгада імя С. М. Кароткіна*). Узнаг. ордэнам Чырв. Зоркі.

КАРОЎКА, шапкавы базідыяльны грыб, тое, што *баркуха*.

КАРОЎЧЫНА, вёска ў Горацкім р-не Магілёўскай вобл., на р. Касінка. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Кароўчына». За 55 *км* на ПдЗ ад Горак, 50 *км* ад Магілёва, 35 *км* ад чыг. ст. Цёмны Лес. 674 ж., гасп. 176 (1971). Мех. майстэрня. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячы яслі-сад, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. У вер. 1943 вёску часткова спалілі нямец.-фаш. захопнікі.

КАРОЦІЧЫ, вёска ў Аздаміцкім с/с Столінскага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр калгаса «Дружба». За 62 *км* на ПнУ ад Століна, 310 *км* ад Брэста, 69 *км* ад чыг. ст. Гарыны. 1260 ж., гасп. 270 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Летам 1944 нямец.-фаш. захопнікі спалілі вёску, расстралялі 41 мірнага жыхара.

КАРОЦЬКІ, вёска ў Кармянскім р-не Гомельскай вобл., каля р. Добрыч. Цэнтр сельсавета. За 5 *км* на Пд ад Кармы, 115 *км* ад Гомеля, 65 *км* ад чыг. ст. Рагачоў. 411 ж., гасп. 160 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, сталовая, магазін. Помнік 152 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

КАРП (Cyprinus carpio), рыба сям. *карпавых*, прыручаная форма *сазана*. Выведзены высокапрадукцыйныя пароды К.: люстраны, рамкавы, лускаваты, голы і інш., якія хутка растуць, маюць смачнае і тлустае мяса. На Беларусі К.— асн. аб'ект таварнай сажалкавай рыбагадоўлі.

Цела К. тоўстае, спіна шырокая, цёмная, бакі залацістыя або медна-жоўтыя. У залежнасці ад умоў гадоўлі і пароды маса розная (25—30 *г* у сяголетка, 500—600 *г* у двухлетка). Палавая спеласць настае на 4—5-м годзе жыцця. Плоднасць да 1 млн. ікрынак. Кормяцца К. інтэнсіўна пры *t* 20—26 °С, маляўкі — інфузорыямі, дробнымі ракападобнымі, малюскамі, дарослыя — усеядныя. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Рыбы*.

Літ.: Жуков П. И. Рыбы Белоруссии, Мн., 1965.

КАРПАВІЧЫ, вёска ў Хаценчыцкім с/с Вілейскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр саўгаса «Карпавічы». За 60 *км* на ПдУ ад Вілейкі, 100 *км* ад Мінска, 41 *км* ад чыг. ст. Уша. 326 ж., двароў 97 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячы сад, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, швейная майстэрня, 2 магазіны.

КАРПАВЫЯ (Cyprinidae), сямейства касцістых рыб атр. карпападобных. Больш за 1000 відаў (каля 200 родаў), пашыраных у прэсных і салаватых водах Еўропы, Азіі, Афрыкі і Паўн. Амерыкі. У СССР 123 віды (55 родаў), на Беларусі 25 відаў (19 родаў).

Рыбы разнастайныя паводле вонкавага выгляду і спосабу жыцця. Цела укрыта лускою, радка голае; ёсць глотачныя зубы і жаранок; плавальны пузыр злучаны з кішэчнікам. Некат. віды маюць вусікі. Большасць К.— прамысл. рыбы (*вобла, лешч, сазан, вусач, рыбец, жэрах, карасі, лінь* і інш.), карп — аб'ект сажалкавай гаспадаркі. На Беларусі найб. значэнне маюць *плотка*, лешч, карась, лінь, карп; акліматызуюцца амурскі сазан, сярэбраны карась, белы амур, звычайны і стракаты тауста лобікі.

Літ.: Лебедев В. Д. и др. Рыбы СССР, М., 1969; Жуков П. И. Рыбы Белоруссии, Мн., 1965 (бібліягр.).

КАРПАЛОГІЯ (грэч. karpós плод+...*логія*), раздзел *марфалогіі раслін*, які вывучае плады і насенне (марфагенез, будову, фізіял. працэсы, метады ацэнкі і кантролю насеннага матэрыялу і інш.). К. займаецца стварэннем генетычнай класіфікацыі, складаннем вызначальнікаў пладоў і насення раслін, якія засмечваюць насенны матэрыял. Насенне культурных раслін вывучае таксама *насенняводства*.

КАРПАРАЦЫЯ (лац. corporatio аб'яднанне), аб'яднанне, саюз, таварыства. Тэрмінам К. ў розных краінах называюць арг-цыі рознага тыпу. Паняцце К. мянялася і ў розныя гістар. перыяды.

К. ў сярэднія вякі — аб'яднанні купцоў, рамеснікаў (гільдыі, цэхі). У капіталіст. краінах — некат. прафесійныя аб'яднанні і т. зв. публічныя К., якія выконваюць пэўныя дзярж. функцыі (гар. і сельскія абшчыны, муніцыпалітэты), і прыватныя, якія аб'ядноўваюць уласныя капіталы пайшчыкаў для атрымання прыбытку. У ЗША агульная назва акцыянерных таварыстваў.

КАРПАТЫ (ад слав. хрб, харбат — хрыбет), горная сістэма ў Еўропе, у межах Чэхаславакіі, Польшчы, Венгрыі, СССР (УССР), Румыніі. Утвараюць выгнутую на ПнУ дугу паміж г. Браціславай і цясніной Жалезныя Вароты на Дунаі. Даўж. каля 1500 *км*, шыр. 100—350 *км*. Сярэдняя выш. каля 1000 *м*. Найвыш. пункт г. Герлахаўскі-Шціт (2655 *м*) у Татрах. Падзяляюцца на Зах., Усх. і Паўд. Да К. належаць таксама Зах. Румынскія горы. Зах. К. (ад хр. Малыя К. да даліны р. Попрад) самы высакагорны раён. Найб. высокая цэнтр. ч., падзеленая далінамі на хрыбты: Татры і Нізкія Татры, Вялікая і Малая Фатра і інш. Характэрны старажытнаальпійскія формы рэльефу (каравыя грабяні, цыркі з альпійскімі азёрамі). На Пд далучаюцца сярэдневышынныя Славацкія Рудныя горы і Матра, складзеныя з вапнякоў і вулканічных парод, масіў Бюк (пашыраны карст). На Пн ад Татраў невысокія з акругленымі вяршынямі Высокія Бескіды (г. Бабіна, 1725 *м*), складзеныя з флішавых парод. Ва Усх. К. (ад р. Попрад да даліны р. Прахава) у вонкавым поясе хр. Нізкія Бескіды, на тэр. УССР Горганы, хр. Чарнагора (г. Гаверла, 2061 *м*), горы Таркоў і Уранча ў Румыніі. На З хр. Паланіна, крышт. масівы гор Родна (г. П'етрос, 2305 *м*) і Кэліман. Ва ўнутр. поясе





Карпаты каля г. Рахава. Закарпацкая вобласць.

Вулканічны хр., горы Вігарлат і Харгіта і інш. Паўд. К. (ад р. Прахава да цясніны Жалезныя Вароты) — сярэдневышынныя, з абрывамі па лініях разломаў, з пласкахвалістымі ўчасткамі каля вяршынь (рэшткі стараж. раўнін) і невялікімі карамі. Складзены пераважна з крышталь. парод. Найб. значныя горы Фэгэраш (г. Малдавяну, 2543 *м*), Парынг (г. Мындра, 2518 *м*). Паміж Паўд. і Усх. К. знаходзіцца Трансільванскае плато (400—800 *м*). Рэльеф эразійна-дэнудацыйны, узгорысты. Складзена з неагенавых пясчаных і гліністых тоўшчаў. З захаду плато акаймоўваецца невысокімі вулканічнымі і крышталь. платопадобнымі масівамі Зах. Румынскіх гор (Біхар, Металіч і інш.). У геал. адносінах К.— частка альпійскай геасінклінальнай складкавай вобласці. Вонкавы пояс дугі складзены з флішавых парод мелавога і палеагенавага ўзросту; цэнтр.— з крышталічных; унутр.— з крышталь., глыбінных і эфузіўных вулканічных парод. Да мелавога перыяду на месцы К. былі Пракарпаты, утвораныя ў герцынскую складкавасць. Пазней яны разбурыліся. У меле і палеагене ўзнікла геасінклінальная ўпадзіна, якая запоўнілася магутным флішам. Потым пагружэнне змянілася падняццем і ў неагене ўтварылася сучасная сістэма. Карысныя выкапні: нафта, газ, кам. і калійная солі, жал. руда, поліметалы і інш. Есць мінеральныя крыніцы.

Клімат умерана кантынентальны. Сярэднія т-ра ліп. ў перадгор'ях ад 18 на Пн да 21 на Пд; у гарах 3—5 °С; студз. ў перадгор'ях ад −3 да −5, у гарах −10 °С. Ападкаў ад 800—1200 *мм* на Пд да 1600 *мм* на Пн, пераважна на паўн.-зах. схілах. У катлавінах 600—800 *мм* за год. Максімум ападкаў летам. Снег у гарах трымаецца да 4—7 мес. Рэкі належаць да бас. Дуная, Одры, Віслы, Днястра. Жыўленне рэк снегавое і дажджавое, вясенне-летняе разводдзе, рэзкія ваганні ўзроўняў. Значныя запасы гідраэнергіі. Глебы горныя бурыя лясныя, месцамі ападзоленыя да выш. 1200—1400 *м*, вышэй горна-падзолістыя, з выш. 2200 *м* горна-лугавыя. На Трансільванскім плато ўчасткамі вышчалачаныя чарназёмы і рэндзіны, у далінах рэк алювіяльныя глебы. Значныя прасторы плато і ніжніх схілаў гор пад ворывам. У перадгор'ях і нізкагор'ях дубова-букавыя (асабліва на ўсх. схілах) і дубова-грабова-букавыя лясы, вышэй на зах. вільготных схілах горныя букавыя. Да верхняй мяжы лесу (1400 *м*) пашыраны хвойна-шыракалістыя (бук, піхта, елка, хвоя) і цёмнахвойныя піхтавыя лясы. На высакагорных участках субальпійская хмызняковая расліннасць (кедравы сланік, ядловец, родадэндран) і альпійскія лугі. На Трансільванскім плато мяшаныя і шыракалістыя, пераважна дубовыя лясы. У перадгор'ях захаваліся невялікія лесастэпавыя ўчасткі. Жывёльны свет: воўк, мядзведзь, ліс, рысь, дзікая кошка, куніца, гарнастай, дзік, казуля, вавёрка, хамяк; птушкі — арол, глушэц.

Літ.: Украина, М., 1969 (Советский Союз); Природа Українських Карпат, Львів, 1968; Ермов Р. А. Западная Европа, М., 1960.

В. А. Дзяменцьеў.

КАРПАЎ Леў Якаўлевіч [18(30).4.1870, Кіеў — 6.1.1921], прафесійны рэвалюцыянер, вучоны-хімік, адзін з арганізатараў сав. хім. прамысловасці. Чл. КПСС з 1897. У 1904 узначальваў Паўд. бюро ЦК РСДРП, у 1906—07 сакратар Маск. к-та партыі. За рэвалюц. дзейнасць няраз арыштоўваўся і высылаўся. Арганізаваў (1911—15) першыя ў Расіі кафольна-шкіпінарныя з-ды і з-ды па выт. хлараформу і вадкага хлору. У 1918 узначальваў Аддзел хім. прамысловасці ВСНГ. Ініцыятар стварэння (1918) н.-д. хім. ін-та ў Маскве (з 1931 Фізіка-хім. ін-т імя Карпава).

Літ.: Писаржевский О. Страницы жизни большевика-ученого. М., 1960; Светом ленинских идей, 2 изд., М., 1969, с. 236—250; Гамбург Д. Л. Лев Яковлевич Карпов, «Наука и жизнь», 1968, № 11.

КАРПАЎ Уладзімір Барысавіч [н. 13(26).2.1912, г. Хвалынск Саратаўскай губ.], беларускі савецкі пісьменнік. З сям'і ўрача. Скончыў Мінскі пед. ін-т (1941). З 1921 жыве на Беларусі. Працаваў на пільні ў Рэчыцы (1929—31), настаўнікам (1931—41). У Айч. вайну ў партызанах. Супрацоўнік час. «Полымя» (1947—60). Літ. дзейнасць пачаў як крытык у 1944. Аўтар зб. літ.-крытычных артыкулаў «Па шляху сталасці» (1952), «Крылаты ўзлёт» (1966). Аповесць «Без нейтральнай паласы» (1949) і раман «Нямігі крывавы берагі» (1962) прысв. барацьбе бел. партызанаў і падпольшчыкаў супраць ням.-фаш. захопнікаў. Раманы «За годам год» (1955—56), «Вясеннія ліўні» (1959—60), «Сотая маладосць» (1969) пра рабочы клас, інтэлігенцыю рэспублікі; пераклў. на рус. і ўкр. мовы. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.



Тв.: За годам год, Мн., 1957; Вясеннія ліўні, Мн., 1961; Сотая маладосць, Мн., 1971; Нямігі крывавыя берагі, Мн., 1972; Аўтабіяграфія, у кн.: Пяцьдзесят чатыры дарогі, Мн., 1963.

Літ.: Кулешов Ф. И. Современная белорусская проза, М., 1970; Герцовіч Я. Тры раманы Уладзіміра Карпава, у яго кн.: Творчае крэда. Мн., 1970; Пашкевич Н. Жизнь, конфликты, характеры, «Советская Отчизна», 1958, № 3.

КАРПАЎКА, вёска ў Лоеўскім р-не Гомельскай вобл., каля Сажа (1 *км*). Цэнтр сельсавета і саўгаса «Карпаўка». За 12 *км* на ПнУ ад Лоева, 80 *км* ад Гомеля, 45 *км* ад чыг. ст. Якімаўка. 583 ж., двароў 173 (1971). Кандытарскі цэх, цэх безалкагольных напіткаў, сепаратарны пункт, швейная майстэрня. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі, сталовая, 2 магазіны. У кастр. 1943 вёску частково спалілі ням.-фаш. захопнікі.

КАРПАЎЦЫ, вёска ў Малаберастаўіцкім с/с Берастаўіцкага р-на Гродзенскай вобл. Да 1971 цэнтр калгаса «Балышавік». За 5 *км* на Пн ад Вял. Берастаўіцы, 58 *км* ад Гродна, 15 *км* ад чыг. ст. Берастаўіца, на аўтамаб. дарозе Вял. Берастаўіца — Гродна. 207 ж., двароў 67 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, магазін. Помнік на брацкай магіле 42 сав. воінаў Айч. вайны.

КАРПАЧ Іван Ільіч (г. н. невяд.— люты 1744), адзін з кіраўнікоў сялянскага антыфеад. руху ў Крычаўскім старостве ў 1-й пал. 18 ст. Сын крычаўскага рамесніка. Па просьбе сялян складаў скаргі на самавольства арандатараў і адміністрацыі староства і няраз сам дастаўляў іх уладальніку староства Радзівілу ў Мір, Нясвіж ці Гродна. Гэтым заваяваў сімпатыю і давер да сябе сялянскіх мас. У Углянскім войтаўстве заснаваў в. Карпачы, куды і сам пераехаў на жыхарства. У снеж. 1718 К. арганізаваў выступленне сялян супраць замкавай адміністрацыі, за што быў арыштаваны і пасаджаны ў крычаўскую турму. З 1741 уваходзіў у склад Крычаўскага магістрата (бурмістр). У перыяд масавых сялянскіх хваляванняў у старостве (пачаліся ў 1740) і ў час *Крычаўскага паўстання 1743—44* К. быў адным з сялянскіх правадыроў. Пасля разгрому паўстання пакараны смерцю (жывым насаджаны на кол).

Літ.: Мялешка В. Крычаўскае паўстанне. «Полымя», 1971, № 1. *В. І. Мялешка.* Мінск.

КАРПАЧОЎ Яфрэм Майсеевіч [н. 27.6(10.7).1914, г. Трубчэўск Арлоўскай губ.], беларускі савецкі гісторык. Д-р гістар. н. (1970). З рамеснікаў. Чл. КПСС з 1953. Скончыў Варонежскі пед. ін-т (1937). Удзельнік Айч. вайны. З 1946 дырэктар ЦДАКР БССР, з 1949 навук. супрацоўнік Ін-та гісторыі АН БССР. Працы па сац.-эканам. гісторыі гарадоў Беларусі 17—18 ст. Адзін з аўтараў 2-томнай «Гісторыі Беларускай ССР» (т. 1, 1961), кніг «Полацк» (1962), «Гісторыя Мінска» (1967).

Тв.: Мануфактура с принудительным трудом и ее значение в развитии капитализма, «Вопросы истории», 1962, № 8; Феодальные юридики в королевских городах Белоруссии XVII—XVIII веков, «Советское славяноведение», 1968, № 6; Міста і містечка Білорусіі у другій половині XVIII ст., «Український історичний журнал», 1968, № 9.

КАРПЕЗА Ігнат Іванавіч [н. 13(25).11.1898, в. Куталеўка Дзісенскага пав. Віленскай губ.], генерал-лейтэнант (1946). З сялян. Чл. КПСС з 1919. Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1936). У арміі з 1915, у Чырв. Арміі з снеж. 1918. У грамадз. вайну на Паўд.-Усх., Паўд., Зах. франтах — камісар батальёна, палка, брыгады. З 1936 камандзір дывізіі, нач. ваен. вучылішча. У 1941—59 нам. камандуючага войск ваен. акругі. З ліст. 1959 у запасе. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 4 інш. ордэнамі, медалямі. Жыве ў Кіеве.



КАРПЕКІ, вёска ў Гаранскім с/с Полацкага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Шлях Леніна». За 12 *км* на У ад Полацка, 88 *км* ад Віцебска, 6 *км* ад чыг. ст. Гараны. 153 ж., гасп. 49 (1971). Дом культуры, б-ка, магазін. У Айч. вайну ням.-фаш. захопнікі спалілі вёску.



КАРПЕНКА Акім Паўлавіч [н. 4(17).9.1915, мяст. Лоеў Рэчыцкага пав. Мінскай губ.], Герой Сав. Саюза (1944). Скончыў авіяц. школу (1936). У Чырв. Арміі з 1933. У Айч. вайну на фронце з 22.6.1941 — штурман эскадрыллі на Паўд.-Зах., Паўд., Паўн.-Каўказскім франтах. Зрабіў 236 баявых вылетаў, у т. л. 184 на далёкія варожыя аб'екты. Жыве ў Бендэрах Малдаўскай ССР.

КАРПЕНКА Васіль Рыгоравіч (1910, ст. Міхайла-Лявонцьеўская Вобласці Войска Данскога — 22.7.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1931. На фронце з 1941. Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра і вызваленні Магілёва. Падраздзяленне пад кіраўніцтвам К. перабралася цераз раку, захапіла плацдарм і адбівала варожыя контратакі. На чале роты К. першы ўварваўся ў Магілёў і вёў бой да поўнага вызвалення горада.

КАРПЕНКА Вілій Іванавіч (н. 1924, мяст. Усвяты Веліжскага пав. Віцебскай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1943. На фронце з 1942, камандзір сапёрнага ўзвода. Вызначыўся ў Беларускай аперацыі. У ноч на 22.6.1944 на чале ўзвода зрабіў праходы ў мінных палях і ў драцяной загародзе на подступах да р. Проні. У час атакі правёў пяхоту цераз праходы без страт. У ноч на 3.7.1944 знайшоў брод цераз Бярэзіну, і пераправіў 2 палкі.

КАРПЕНКА-КАРЫ [сапр. Табілевіч Іван Карпавіч; 17(29).9.1845, с. Арсеневўка каля Елізаветграда — 2(15).9.1907], украінскі драматург, акцёр, рэжысёр і тэатр. дзеяч. Адзін з заснавальнікаў рэаліст. нар. т-ра на Украіне. Скончыў Бабрынецкае павятовае вуч. (1859). З 1865 удзельнічаў у аматарскіх спектаклях, пасля — у трупах М. Старыцкага, М. Крапіўніцкага, М. Садоўскага. У 1884—87 паліт. ссыльны ў Новачаркаску. Друкавацца пачаў (1876) як тэатр. крытык, перакладчык і публіцыст. Першае апавяд. «Навабранец» (1883) пра цяжкае становішча сялян. Аўтар рэаліст.-бытавых драм «Бурлака» (1883, апубл. 1895), «Наймічка» (1885, апубл. 1887), «Абяздоленая» (1886), гістар. трагедыі «Сава Чалы» (1899) і інш. Абвастрэнне класавых супярэчнасцей у ўкр. грамадстве 2-й пал. 19 ст. адлюстраваў у сацыяльных сатыр. камедыях «Разумны і дурань» (1886), «Мартын Баруля» (1886, апубл. 1891), «Сто тысяч» (нап.

1890). Багацце драм. сітуацый, дынамічнасць, сатыр. завастрэнне камедыйных вобразаў, жывая нар. мова — асн. асаблівасці драматургіі К.-К.

Тв.: Твори, т. 1—6. Харків — Київ, 1929—31; Твори, т. 1—3, Київ, 1960—61; Вибрані п'єси, Київ, 1970; рус. пер.— Пьесы, М., 1958.

Літ.: Стеценко Л., І. Карпенко-Карий (І. К. Тобілевич), Київ, 1957; Скрипник І. Іван Карпенко-Карий, Київ, 1960; Тобілевич С. Мої стежки і зустрічі, Київ, 1957.

КАРПЕНЦЬЁР (Carpentier) Алеха (н. 26.12. 1904, Гавана), кубінскі пісьменнік, удзельнік рэвалюц. барацьбы супраць рэакц. рэжымаў на Кубе. Вывучаў архітэктуру ў Гаване, музыку ў Парыжы. У 1928—39, 1945—59 у эміграцыі. Пасля перамогі Кубінскай рэвалюцыі 1959 актыўна ўключыўся ў буд-ва сацыялісц. культуры. Друкуецца з 1922. Першы зб. «Антыльскія вершы» (1932, Парыж). Аўтар аповесці «Царства зямное» (1949, рус. пер. 1962), раманаў «Страчаныя сляды» (1953, рус. пер. 1964), «Век асветніцтва» (1962, рус. пер. 1968), даследавання «Музыка Кубы» (1946, рус. пер. 1962). Чл. кіраўніцтва Саюза пісьменнікаў і мастакоў Кубы, дырэктар Нац. выд-ва.

КАРПІЛАВА (дзявочае Разенблат) Бася Залманаўна (н. 20.3.1921, Баку), беларуская савецкая артыстка балета. Засл. арт. БССР (1961). Скончыла Маск. харэагр. вучылішча (1939). Салістка балета Муз. т-ра імя Неміровіча-Данчанкі (1939—41), ансамбля Каспійскай ваеннай флатыліі (1941—44), у 1944—61 — Бел. т-ра оперы і балета. З партый: Адылія («Лебядзінае возера» П. Чайкоўскага), Эсмеральда («Эсмеральда» Ц. Пуні), Кітры («Дон Кіхот» Л. Мінкуса), Фані («Сцежкаю грому» К. Караева), Марылька («Салавей» М. Крошнера), Рузя («Падстаўная нявеста» Г. Вагнера).

КАРПІЛАЎ Віктар Рыгоравіч (н. 8.12.1927, Мінск), беларускі савецкі рэжысёр. Засл. дз. маст. БССР (1967). Скончыў Бел. тэатр.-мастацкі ін-т (1949). Акцёр Рус. т-ра БССР у 1949—53. З 1956 рэж. на Бел. тэлебачанні. Паставіў тэлеспектаклі: «Млын на Сініх Вірах» У. Караткевіча і «Якаў Багамолаў» М. Горкага (1959), «Тэатр купца Япішкіна» Е. Міровіча (1960), «Сэрца на далоні» паводле І. Шамякіна (1964), «Дзікунка» А. Астроўскага і М. Салаўёва, «Крах» па п'есе А. М. Талстога і П. Шчогалева «Змова імператрыцы» (1966), «Адно толькі слова» М. Барана і А. Ваксера (1967), «Ткачы» Г. Гаўптмана (1969); тэлеоперу «Ранак» Г. Вагнера (1968); дакумент. фільмы «Біяграфія маёй рэспублікі» (1968, 2-я і 3-я серыі), «Помнікі не маўчаць» (1971).

КАРПІЛАЎ Рыгор Хацкелевіч [6(18).6.1891, Мінск — 13.2.1949], беларускі савецкі вучоны ў галіне аталарынгалогіі. Д-р мед. н., праф. (1938). Скончыў мед. ф-т 2-га Маскоўскага ун-та (1923). Працаваў у Маскве, Уладзіміры (1923—27). На кафедры аталарынгалогіі мед. ф-та БДУ і Мінскага мед. ін-та (1927—34), заг. кафедры аталарынгалогіі Віцебскага (1934—41) і Мінскага (1944—49) мед. ін-таў. Асн. працы па анатоміі, пытаннях клінікі, лячэння склеромы і інш. хвароб вуха, горла і носа.

Тв.: Нос и придаточные полости у лабораторных амфибий, птиц и грызунов. Топографическое исследование, Витебск, 1948, № 5.

КАРПІЛОВІЧ Юрый Уладзіміравіч (н. 24.1934, Мінск), наватар вытворчасці, лаўрэат Дзярж. прэміі СССР (1970). Чл. КПСС з 1957. Скончыў Беларускі політэхн. ін-т (1957). З 1958 на Мінскім з-дзе электронных вылічальных машын імя Арджанікідзе, з 1971 нам. гал. інжынера. Дзярж. прэмія СССР прысуджана за ўдзел у стварэнні сям'і універсальных электронных вылічальных машын другога пакалення тыпу «Мінск» і за асваенне іх серыйнай вытворчасці.

КАРПІНСКІ Аляксандр Пятровіч [26.12.1846 (7.1.1847), Багаслоўск Верхатурскага пав. Пермскай губ.— 15.7.1936], савецкі геолаг. Акад. Пецярбургскай АН (1889), акад. АН БССР (1928). Скончыў горны ін-т у Пецярбургу (1866), дзе выкладаў у 1868—96. У 1885—1903 дырэктар Геал. камітэта. З 1917 першы прэзідэнт АН СССР. Раскрыў асн. рысы тэктанічнай будовы Усх.-Еўрап. платформы, распрацаваў метад тэктанічнага аналізу, заснаваў палеагеагр. метад вывучэння асадкавых горных парод, склаў геал. карты Урала і Еўрап. ч. Расіі. Даследаваў магматычныя пароды, карысныя выкапні на Урале, у Данбасе і інш. Вывучаў шматлікіх выкапнёвых жывёл. Пахаваны на Краснай плошчы. Імем К. названы горад у Свярдлоўскай вобл. (б. Багаслоўск), вулкан на Курыльскіх а-вах.



Тв.: Собр. соч., т. 1—4, М.— Л., 1939—49; Очерки геологического прошлого Европейской России, М.–Л., 1947.

Літ.: Черноусов Я. М. Академик А. П. Карпинский, Свердловск, 1962; «Вестник АН СССР», 1936, № 7 [увесь час. прысвечаны К.]; Жырмунскі А. М., А. П. Карпінскі і яго роля ў вывучэнні геалагічнай будовы БССР, «Запіскі АН БССР», 1936, в. 6.

КАРПІНСКІ Вячаслаў Аляксеевіч (16.1.1880, Пенза — 20.3.1965), савецкі парт. і дзярж. дзеяч, публіцыст. Герой Сац. Працы (1962). Д-р эканам. н. З сям'і інтэлігента. Чл. КПСС з 1898. З 1897 вёў рэвалюц. работу ў Харкаве, Растове-на-Доне; адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Харкаўскага «Саюза барацьбы за вызваленне рабочага класа». У 1902 сасланы ў Валагодскую губ., уцёк. З 1904 у эміграцыі; у Жэневе сустракаўся з У. І. Леніным, працаваў у газ. «Вперед», «Пролетарий». Пасля Кастр. рэвалюцыі рэдактар газ. «Беднота»; заг. агіт.-інструктарскага аддзела ВЦВК. У 1918—27 чл. гал. рэдакцыі «Правды» і інш. газет і часопісаў. У 1936 у апараце ЦК ВКП(б). З 1937 на навук. і прапагандысцкай

рабоце. Чл. ВЦВК 1—7-га скл. Аўтар кніг, брашур і артыкулаў пра У. І. Леніна, па гісторыі кампартыі і Сав. дзяржавы. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна.

Тв.: Беседы о ленинизме, 3 изд., М., 1934; Беседы о коммунизме, 2 изд., М., 1958; Владимир Ильич Ленин — вождь, товарищ, человек, М., 1968.
Літ.: Ленін У. І. Тв. [гл. Даведачны т., ч. 2 (Справочный т. к Полн. собр. соч., ч. 2)].

КАРПІНСКІ (Karpiński) Францішак (4.10. 1741, в. Галаскоў Каламыйскага пав., Галіцыя — 16.9.1825), польскі паэт, пачынальнік сентыменталізму ў польскай л-ры. З 1793 жыў у фальварку Краснік Пружанскага, з 1819 у в. Хораўшчына Ваўкавыскага пав. Гродзенскай губ. Пісаў ідыліі, лірычныя вершы, элегіі, драмы («Забаўкі вершам і прозай», т. 1—7, 1782—87). Выкарыстоўваў фальклорныя матывы («Песня сокальскага дзеда», «Мазурская песня»). У некат. творах («Да Станіслава Малахоўскага», «Чыніш») спачуваў сялянам. Зрабіў уплыў на творчасць В. Дуніна-Марцінкевіча. Творы К. двойчы выдаваліся ў Гродне.

Тв.: Dzieła, t. 1—4, Warszawa, 1806; Pamiętniki, Warszawa, 1898.

КАРПО (Carpeaux) Жан Батыст (11.5.1827, г. Валансьен — 11.10.1875), французскі скульптар. Вучыўся ў Ф. Руда. Працаваў у Парыжы. Стварыў жыццярадасныя, дынамічныя манум.-дэкарат. кампазіцыі (рэльефы: «Флора» для павільёна ў садзе Цюільры, 1866; «Танец» для «Гранд-Апера», 1869; група «Чатыры часткі свету» для фантана ў Люксембургскім садзе, 1869—72), а таксама рэаліст. партрэты — кампазітара Ш. Гуно (1871), пісьменніка А. Дзюма-сына (1873) і інш.

КАРПОВІЧ Вікенцій Паўлавіч [н. 7(20).1. 1914, в. Калодзішчы Ігуменскага пав. Мінскай губ.], Герой Сав. Саюза (1942), палкоўнік (1958). З сялян. Чл. КПСС з 1942. Скончыў Ін-т нац. меншасцей (1937), Ваен. акадэмію каманднага і штурманскага саставу ВПС (1944). У Айч. вайну з 22.6.1941 на Паўд. і 1-м Укр. франтах — лётчык-знішчальнік, нам. камандзіра знішчальнага авіяц. палка. Удзельнік вызвалення Растова-на-Доне, Украіны, Малдавіі. Зрабіў 263 баявыя вылеты, удзельнічаў у 35 паветр. баях. З 1960 у запасе. Жыве ў Краснадары.



КАРПОВІЧ Лявонцій (свецкае імя Лонгін, Логін; н. пасля 1580, Пінскі пав.— вер. 1620), беларускі пісьменнік-палеміст, педагог, царкоўны дзеяч. З сям'і святчэнніка. Адукацыю атрымаў у Астрожскай школе на Валыні. Выступаў супраць Брэсцкай уніі. Садзейнічаў выданню «Фрыпаса» і «Граматыкі» М. Сматрыцкага. У 1610 за выданне «Фрыпаса» і інш. палемічных твораў зняволены. З 1613 архімандрыт віленскага Святадухаўскага манастыра. Узначальваў навуч. і выдавецкую дзейнасць правасл. брацтва ў Вільні і Еўі, быў рэктарам брацкай школы. Аўтар твораў: «Казание двое...» (Еўе, 1615), «Казание на пахаванне князя В. В. Галіцына» (Вільня, 1619), прадмовы да кнігі «Вертаград душэўны» (Вільня, 1620) і інш. Памяці К. прысвечаны «Казание на часнае пахаванне... Лявонція Карповіча» М. Сматрыцкага (Вільня, 1620) і паэт. твор «Лямант у свеце ўбогіх на жаласную смерць... Лявонція Карповіча» (Вільня, 1620).

Літ.: Харлампович К. Западно-русские православные школы XVI и начала XVII в., Казань, 1898, с. 397—399; Карский Е. Ф. Белорусы, т. 3. (в.) 2, П., 1921, с. 135—140; Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры, т. 1, Мн., 1968, с. 307—308; Українські письменники, т. 1, Київ, 1960, с. 358—361.
М. Б. Бацвінік, Г. Я. Галенчанка. Мінск.

КАРПОВІЧ Марыя Мікалаеўна (н. 8.3.1930, в. Палужжа Навагрудскага пав. і ваяводства), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1966). Скончыла Беларускую с.-г. акадэмію (1954). У 1954—55 аграном Любчанскай МТС, з 1955 гал. аграном калгаса «Зорка» Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Кастр. Рэв., медалямі.

Літ.: Пакалодкіна В. Шырокае поле, у кн.: Сцяганосцы новага, перадавога, Мн., 1967; Осин А. Е. Технолог сельскохозяйственного производства, Мн., 1967.

КАРПОВІЧ Міхал (4.10.1744, Камянец Брэст-Літоўскага ваяводства — 5.11.1803), асветнік, публіцыст, палітычны дзеяч. Праф. Гал. літоўскай школы. Прапагандаваў ідэі франц. асветнікаў. Адзін з першых на Беларусі і ў Літве крытыкаваў прыгон, жорсткае абыходжанне феадалаў з сялянамі, асуджаў становішча, пры якім «галава селяніна ацэньваецца адналькава з галавою жывёлы». Змагаўся за ўвасабленне ў жыццё прынцыпаў Канстытуцыі 3 мая 1791, якая была накіравана на ліквідацыю феад. анархіі і павінна была садзейнічаць паліт. і эканам. ўмацаванню Польшчы. У час паўстання 1794 уваходзіў у склад паўстанцкага ўрада.

Літ.: Konopczyński W. Polscy pisarze polityczni XVIII wieku, t. 1, Warszawa, 1966; Lésnodorski B. Polscy jakobini, Warszawa, 1960.
А. А. Бірала. Мінск.

КАРПОВІЧ Пётр Уладзіміравіч [3.10.1874, Гомель — 31.3(13.4).1917], рэвалюцыянер-тэарыст. Вучыўся ў Гомельскай і Слуцкай гімназіях, у Маскоўскім (1895—96) і Юр'еўскім (1898—99) ун-тах. У 1896—98 вёў рэвалюц. агітацыю ў Гомелі і Нясвіжы, адзін з арганізатараў Гомельскага к-та РСДРП, забяспечваў Гомель марксісцкай л-рай у 1898—99. У 1900—01 зблізіўся з эсэрамі. 14(27).2.1901 смяротна параніў міністра асветы М. П. Багалепава за рэпрэсіі супраць рэвалюц. студэнцтва. Засуджаны на 20 гадоў катаргі. У 1907 уцёк за мяжу, ад рэвалюц. руху адышоў. Яго імем названа вуліца ў Гомелі.

Літ.: Фигнер В. Н. Шлиссельбургские узники. Биографические очерки, М., 1920. *М. В. Біч.* Мінск.

КАРПОВІЧ Эдуард Антонавіч (н. 24.1.1924, Мінск), перадавік энергетыкі, Герой Сац. Працы (1971). Чл. КПСС з 1966. Удзельнік Айч. вайны. З 1947 токар вытв. рамонтнага прадпрыемства «Беларусьэнергарамонт». Званне

Героя Сац. Працы прысвоена за выдатныя поспехі ў выкананні заданняў 8-га пяцігадовага плана развіцця энергетыкі. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.

КАРСАКАВІЧЫ, вёска ў Барысаўскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Камінтэрн». За 38 *км* на ПнЗ ад Барысава, 109 *км* ад Мінска, 43 *км* ад чыг. ст. Барысаў. 358 ж., двароў 110 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. У 1943 вёску часткова спалілі нямфаш. захопнікі. Помнік 152 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

КАРСКАГА Я. Ф. МУЗЕЙ, засн. ў 1964 у Лашанскай школе імя Карскага (в. Лаша Гродзенскага р-на) на радзіме Я. Ф. *Карскага*. У музеі экспануюцца асабістыя рэчы вучонага, аўтографы, фотакопіі рукапісаў, навук. працы, «Этнаграфічная карта беларускага племя». Абсталяваны стэнды, якія расказваюць пра жыццёвы і творчы шлях вучонага. Зберагаюцца мікрафільмы дакладаў Карскага, прысланыя Пражскай АН на чэшскай мове, успаміны яго дачкі Н. Я. Баркоўскай-Карскай, унучкі Т. С. Карскай, чл. кар. АН СССР В. І. Баркоўскага. *А. П. Цыхун.* Гродна.

КАРСКАЕ МОРА, ускраіннае мора Паўн. Ледавітага ак. паміж а-вамі Новая Зямля, Зямля Франца-Іосіфа, Паўн. Зямля і ўзбярэжжам Сібіры. Пл. 883 тыс. *км*². Найб. глыб. да 620 *м*, сярэдняя 118 *м*.

На Пд утварае залівы: Енісейскі, Обскую губу, Байдарацкую губу і інш. У К. м. ўпадаюць рэкі Енісей, Об, Кара. Шмат астравоў. Праз а-вы Ушакова і Адзіноты працягнулася падводнае Цэнтр. Карскае ўзв. (глыб. 20—100 *м*), ускладненае жалабамі Вароніна на У і Св. Ганны на ПнУ. На ПдЗ Новаазямельская ўпадзіна (глыб. 420 *м*, паводле інш. звестак 540 *м*). Клімат арктычны. Частыя штормы. Сярэдняя т-ра вады на паверхні: летам на Пд да 7, на Пн −0,5, −0,1 °С. Салёнасць на Пд 8,0—10,0‰, на Пн 33,0—33,5‰. На ПдЗ цячэнне з цыклянічным кругазваротам. Круглы год мора ўкрыта плывучымі льдамі, на Пд зімою шырокі прыпай. Водзяцца траска, муксун, нельма, омуль, навага, нерпа, бялуха. К. м.— частка Паўн. марскога шляху і шляху да вусцяў рэк Об і Енісей. Найб. порты: Салехард, Дыксан, Дудзінка, Ігарка (на Енісеі).

КАРСКІ Мацвей (1662—1717), прадстаўнік схаластычнай філасофіі на Беларусі і ў Літве. Праф. Віленскай акадэміі (1696—99). Адступаў ад традыц. выкладання схаластыкі, уводзіў элементы прыродазнаўства, спасылаўся на некат. філосафаў і вучоных новага часу. Логіку лічыў моваю навукі. З абстрактных пазіцый разглядаў праблемы права і справядлівасці. Аўтар «Курса філасофіі» (рукапіс захоўваецца ў навук. бібліятэцы Вільнюскага ун-та).

Літ.: История философии в СССР, т. 1, М., 1968, с. 428. *Э. К. Дарашэвіч.* Мінск.

КАРСКІ Яўхім Фёдаравіч [20.12.1860 (1.1. 1861), в. Лаша Гродзенскага пав.— 29.4.1931], савецкі філолаг-славіст, заснавальнік беларускага мовазнаўства, філалогіі і фальклярыстыкі. Акад. (1916, чл.-кар. з 1901), правадзейны чл. Ін-та бел. культуры (1922), Чэшскай АН (1929). Скончыўшы Нежынскі гісторыка-філал. ін-т (1885), настаўнічаў у Вільні. З 1893 лектар, з 1894 праф., у 1905—10 рэктар Варшаўскага, з 1917 праф. Петраградскага ун-таў. У 1905—17 рэдактар «Русского филологического вестника», з 1920 «Известий Отделения русского языка и словесности Российской Академии наук». Аўтар капітальных прац ва ўсіх галінах бел. мовазнаўства і бел. славеснасці — дыялекталогіі, сучаснай літ. мовы, гісторыі бел. мовы, фальклору, гісторыі бел. л-ры. Шмат зрабіў К. і для развіцця бел. этнаграфіі. Этнагр. тэорыі К. пра паходжанне бел. народнасці лягла ў аснову даследаванняў інш. вучоных. К. належаць каштоўныя працы па гісторыі слав. моў, па дыялектах рус. і ўкр. мовы, мове рус. мастацкай л-ры, гісторыі слав. мовазнаўства. Адметная асаблівасць даследаванняў К.— выкарыстанне ў іх надзвычай вялікага фактычнага матэрыялу, упершыню ўведзенага ім у навуку, дакладныя вывады, якія не страцілі вартасці і ў наш час. К. вывучаў гаворкі Беларусі, стараж. рукапісныя і друкаваныя бел. помнікі. Дзякуючы К., аўтару «Праграмы для збору асаблівасцей беларускіх гаворак» (1917 і 1916), рэдактару адказаў на яе і арганізатару ўсёй працы па вывучэнні бел. гаворак, пачалося планавае даследаванне бел. дыялектаў. Адказы на праграму, паездкі ўдзельнікаў умоўных межаў бел. дыялектнай мовы дазволілі магчымасць К. стварыць упершыню набудаваную на навук. фактах «Этнаграфічную карту беларускага племя», у якой для вызначэння межаў бярэцца пад увагу выключна мова, а таксама карту бел. гаворак («Беларусы», т. 1, Варшава, 1903). К.— выдатны знаўца быту і творчасці беларусаў. Ён сам запісваў творы бел. фальклору («Беларускія песні с. Беразавец Навагрудскага пав. Мінскай губ.», 1884—85; «Беларускія песні з Навасёлкі-Затроцкія Віленскай губ. Троцкага пав.», 1889), дакладна перадаючы асаблівасці мясцовых гаворак, заахвочваў і падтрымліваў вучоных-фальклярыстаў — П. В. Шэйна, Е. Р. Раманава, М. Я. Нікіфароўскага і інш. Цэнтральнае месца ў навук. спадчыне К., гал. помнік яго жыцця, праўдзіва названы беларускай энцыклапедыяй,— капітальная трохтомная праца «Беларусы». У сямі выпусках «Беларусаў» даследуецца нар. славеснасць, мова (фанетыка, марфалогія, сінтаксіс) у яе гістар. развіцці, бел. л-ра (стараж. і новая). У «Беларусах» вызначаны і задачы ў галіне вывучэння бел. мовы, з якіх галоўная — складанне поўнага бел. слоўніка і гістар. слоўніка бел. мовы. Вялікае значэнне маюць працы К. па гісторыі рус. мовы, у прыватнасці даследаванні сінтаксісу «Лаўрэнцьеўскага летапісу», мовы «Рускай праўды». К. напісаў шэраг прац па слав. палеаграфіі («Славянская кірылаўская палеаграфія», 1928, і інш.), выдаў найстараж. помнікі «Ліставе Ундольскага», «Лаўрэнцьеўскі летапіс», «Рускую праўду» і інш. з палеаграф. і лінгвіст. аналізам. Аўтар шматлікіх артыкулаў пра айчынных і замежных вучоных-славістаў, рэцэнзій на працы па слав. філалогіі, фальклярыстыцы і этнаграфіі. На радзіме вучонага створаны музей (гл. *Карскага Я. Ф. музей*).



Тв.: Обзор звуков и форм белорусской речи, М., 1885; К истории звуков и форм белорусской речи, Варшава, 1893; О языке так называемых литовских летописей, Варшава, 1894; Западнорусские переводы псалтыри в XV—XVII веках, Варшава, 1896; Русская диалектология, Л., 1924; Очерк научной разработки русского языка в пределах СССР, Л., 1926; Наблюдения в области синтаксиса Лаврентьевского списка летописи, Л., 1929; Белорусы. Язык белорусского народа, в. 1—3, М., 1955—56; Труды по белорусскому и другим славянским языкам, М., 1962.

Літ.: Баркоўскі В. І. Заснавальнік беларускага мовазнаўства і беларускай філалогіі (Да 100-годдзя з дня нараджэння акад. Я. Ф. Карскага), «Працы Ін-та мовазнаўства АН БССР», 1961, в. 8; Яго ж. Академик Е. Ф. Карский (1861—1931), Ярославль, 1945; Бандарчык В. К., Я. Ф. Карскі, у яго кн.: Гісторыя беларускай этнаграфіі. Пачатак XX ст., Мн., 1970; Лянцуноў Б. М. Очерк жизни и деятельности акад. Карского, «Известия АН СССР», 1932, № 3; Лобан М. Заснавальнік беларускай філалогіі, «Полымя», 1961, № 1; Раманоўіч Я. М. і Юрэвіч А. К. Бібліяграфія прац Я. Ф. Карскага, «Працы Ін-та мовазнаўства АН БССР», 1961, в. 8; Беларускае мовазнаўства. Бібліягр. ўказальнік (1825—1965), Мн., 1967, с. 56—59.

В. І. Баркоўскі. Масква.

КАРСКІЯ ВАРОТЫ, праліў паміж а-вамі Новая Зямля і Вайгач. Злучае Баранцава і Карскае моры. Даўж. праліва каля 45 *км*, шыр. каля 50 *км*, найб. глыб. на фарватэры 100 *м*. З кастр. да жніўня — плывучыя льды.

КАРСТ, карставыя з'явы (ад назвы вапняковага плато ў Югаславіі), комплекс з'яў, якія ўзнікаюць ад растварэння горных парод прыроднымі водамі. Развіваецца ў вапняках, даламітах, мелі, гіпсах, каменнай солі і інш. растваральных пародах. Утварае своеасаблівыя формы рэльефу (варонкі, катлавіны, яры, калодзежы, барозны-кары), падземныя пустоты, мінер. нацечныя ўтварэнні (сталактыты, сталагміты), садзейнічае ўтварэнню падземных азёраў і рэк.

Развіццю К. спрыяе высокая порыстасць і шчылінаватасць парод, інтэнсіўная цыркуляцыя паверхневых і падземных водаў, налучэнасць у водах свабоднай CO_2 (для растварэння карбанатных парод). Плошчы, занятыя растваральнымі пародамі, перавышаюць 51 млн. км². Вядомы К. у СССР (Крым, Каўказ, Урал, Закарпацце, Руская раўніна, Сярэдняя Азія, Усх. Сібір, Д. Усход і інш.). Зах. Еўропе, Паўд.-Усх. Азіі, Індыі, Аўстраліі, ЗША. На Беларусі адзначаны ў карбанатных пародах дэвонскага і мелавога ўзросту. У Прыпяцкай упадзіне да каверназных закарставаных парод верхняга дэвону прымеркаваны паклады нафты. Вывучэнне К. важнае для гідратэхн. буд-ва, водазабеспячэння, праходкі горных выпрацовак, ацэнкі перспектыў нафтаноснасці карбанатных парод. Гл. таксама *Спелеалогія*.

Літ.: Гвоздецкий Н. А. Карст, 2 изд., М., 1954; Соколов Д. С. Основные условия развития карста. М., 1962; Дрозд В. В. О карстовых явлениях в Белоруссии, «Известия Всесоюзного геогр. об-ва», 1964, т. 96, в. 1. *І. І. Ур'еў.* Мінск.

КАРТАГРАМА ў геаграфіі (ад грэч. chartēs аркуш+gramma запіс), карта, на якой штрыхоўкай ці афарбоўкай паказана сярэдняя інтэнсіўнасць якой-н. з'явы ў межах тэрытарыяльных, найчасцей адм., адзінак.

Для складання К. выкарыстоўваюць адносныя паказчыкі (пераважна статыстычныя), якія групуюцца ў прынятых інтэрвалах у выглядзе ступеньчатай шкалы. Кожнай групе (ступені) адпавядае ступень штрыхоўкі ці афарбоўкі. Пры дапамозе К. адлюстроўваюць матэрыялы статыстыкі насельніцтва (шчыльнасць), с. гасп. (рост паслуўных плошчаў, урадлівасці) і інш. Шырока вядомы *аграхімічныя картаграмы*, якія складаюцца для землекарыстання калгасаў, саўгасаў, адм. раёнаў.

КАРТАГРАФІЯ (ад грэч. chartēs аркуш+ +...*графія*), навука пра *карты геаграфічныя*, метады і працэсы іх складання, друкавання і выкарыстання. К. вызначаюць таксама як навуку пра адлюстраванне і даследаванне размяшчэння ў прасторы спалучэнняў і ўзаемасувязей з'яў прыроды і грамадства праз вобразна-зрокавыя мадэлі, якія ўзнаўляюць рэчаіснасць у абагульненай і наглядной форме. Асн. раздзелы К.: картазнаўства (вывучае геагр. карты, гісторыю іх развіцця, спосабы выкарыстання), матэматычная К. (вучэнне пра ўласцівасці, віды і метады ацэнкі, выбар, вышуканні картаграфічных праекцый для розных картаў), тэорыя генералізацыі і спосабаў адлюстравання, метадаў аналізу картаў, складанне і рэдагаванне картаў, афармленне і выданне картаў, картаметрыя (спосабы вымярэння па картах колькасных характарыстык розных геагр. аб'ектаў), арганізацыя і эканоміка картаграфічнай вытворчасці. К. цесна звязана з геадэзіяй, тапаграфіяй і геаграфіяй.

Асновы К. заложаны ў ант. Грэцыі, дзе складаліся карты з улікам шарападобнасці Зямлі. «Геаграфія» Клаўдзія Пталамея (90—168 н. э.) была найбольш важнай крыніцай для картографаў да эпохі *Вялікіх геаграфічных адкрыццяў*. Вял. дасягненнем рускай К. быў «Вялікі Чарцёж усёй Маскоўскай дзяржавы», складзены каля 1600. Вял. значэнне мелі таксама «Чарцёжная кніга Сібіры» (скл. 1701) і «Атлас Расійскі», выдадзены АН у 1745. На чале геагр. дэпартамента з 1757 стаяў М. В. Ламаносаў, які зрабіў значны ўплыў на развіццё рус. К. ў 18—19 ст. У 18—19 ст. з развіццём капіталізму ствараецца мноства буйнамаштабных картаў на вялікія тэрыторыі, развіваецца матэматычная К. Развіццё і дыферэнцыяцыя прыродазнаўчых навук у 19 ст. садзейнічалі стварэнню спец. картаў — геалагічных, глебавых, кліматычных, эканоміка-геаграфічных і інш. Новых поспехаў дасягнула К. за гады Сав. улады. 15.3.1919 створана картаграфічна-геадэзічная служба СССР, якая працуе пад кіраўніцтвам Гал. ўпраўлення геадэзіі і картаграфіі (ГУГК) пры Савеце Міністраў СССР. Метадалагічныя асновы сав. К. заложаны У. І. Леніным у пісьмах у сувязі з першымі савецкімі атласамі (гл. Ленін В. І. Полн. собр. соч., т. 52, с. 163—165, 234—235). Значныя поспехі дасягнуты ў развіцці тэматычнага і комплекснага картаграфавання, у распрацоўцы комплексных атласаў [Вял. савецкі атлас свету, Маскі атлас, Фізіка-геагр. атлас свету, Атлас Антарктыкі, Атлас развіцця гаспадаркі і культуры СССР, дзесяткі комплексных атласаў рэспублік (у т. л. *Атлас БССР*) і абласцей, Гісторыка-бібліяграфічны атлас пра У. І. Леніна і інш.], тэхналогіі складання і выдання картаў. Развіваецца касмічная К. (складанне картаў іншых планет і Сусвету), стварэнне ацэначна-прагнозных картаў. У СССР з 1956 выдаецца час. «Геодезия и картография». На Беларусі пытанні К. распрацоўваюцца ў АН БССР, на кафедрах ВНУ, у многіх навукова-даследчых ін-тах (К. глебаў у НДІ глебазнаўства і аграхіміі).

Літ.: Салищев К. К. Картография, 2 изд., М., 1971; Картография. Сб. ст., в. 4. 1967—69, М., 1970; 50 лет советской геодезии и картографии, М., 1967; Граур А. В. Математическая картография, 2 изд., Л., 1956; Баранский Н. Н. и Преображенский А. И. Экономическая картография, М., 1962; Соловьев М. Д. Математическая картография, М., 1969; Подобедов Н. С. Полевая картография, М., 1970. *Б. А. Мядзведзеў.* Мінск.

КАРТАГРАФІЯ ГЛЁБАЎ, навука пра *глебавыя карты* і метады іх складання. Раздзел *глебазнаўства*. Мае значэнне вытворчае (інвентарызацыя глебаў, арганізацыя тэрыторыі с.-г. прадпрыемстваў, раянаванне мерапрыемстваў па меліярацыі, ахове ад эрозіі, па найб. рацыянальным выкарыстанні глебаў) і тэарэтычнае (генезіс, класіфікацыя, заканамернасці геагр. пашырэння глебаў). Першыя маршрутныя даследаванні глебаў на Беларусі праведзены на Палессі ў 1878—98 экспедыцыяй пад кіраўніцтвам І. І. Жылінскага.

Літ.: Роговой П. П., Медведев А. Г. и Булгаков Н. П. Развитие работ по изучению почв Белорусской ССР, у кн.: Труды Ин-та почвоведения, в. 1, Мн., 1961; Почвенная съемка, М., 1959.

І. М. Салавей. Мінск.

КАРТАДЫЯГРАМА (ад грэч. chartēs аркуш+diágramma рысунак, адбітак), карта, на якой пэўнымі фігурамі паказваюць сумарную велічыню асобнай прыкметы ў межах тэрытарыяльнай, пераважна адм., адзінкі.

Для пабудовы К. выкарыстоўваюць сумарныя абсалютныя паказчыкі (пераважна статыстычныя), якія адлюстроўваюцца на картах лінейнымі дыяграмамі (слупкі, палоскі), плошчавымі (квадраты, кругі), аб'ёмнымі (кубы, шары) і іх камбінацыямі. К. найчасцей карыстаюцца для характарыстыкі размеркавання па краінах, абласцях, раёнах колькасці насельніцтва, валавой прадукцыі прамысловасці і асобных яе галін, пл. лясоў, балотаў і інш.

КАРТАСХЕМА (ад грэч. chartēs аркуш+schēma вонкавы выгляд, форма), спрошчаная, безмаштабная карта без картаграфічнай сеткі. Вылучае найб. істотныя рысы паказанай на К. з'явы (падзеі) і дае ў наглядной форме агульнае ўяўленне пра яе. Ужываюцца як картаграфічныя ілюстрацыі да тэкстаў у падручніках, навук.-папулярнай л-ры, на ўроках, лекцыях.

КАРТУЗ, мужчынскі летні галаўны ўбор з казырком. На Беларусі пашыраны з сярэдзіны 19 ст. Шыўся пайчасцей з чорнага сукна. У канцы 19 — пач. 20 ст. пераважалі К. накшталт былых вайсковых з шырокім каляровым аколышкам (сінім, зялёным, жоўтым, чырвоным) і цвёрдым. часам лакіраваным казыркам.

КАРТУЗ-БЯРОЗА, адна з назваў горада *Бярозы* да 1940.

КАРТУШ (франц. cartouche), скульптурнае ці графічнае ўпрыгожанне. Мае выгляд дэкаратыўна аканмаванага шчыта ці разгорнутага не да канца скрутка, часта з эмблемаю, гербам, надпісам.



КАРТЫ ГЕАГРАФІЧНЫЯ, паменшаныя абагульненыя адлюстраванні зямной паверхні на плоскасці, якія паказваюць з дапамогай умоўных знакаў размяшчэнне і сувязь прыродных і грамадскіх з'яў, што адбіраюцца і характарызуюцца ў залежнасці ад прызначэння кожнай канкрэтнай карты. Ад інш. адлюстраванняў зямной паверхні (аэраздымка, малюнкі і г. д.) К. г. адрозніваюцца: спец. матэматычным законам пабудовы карты (картаграфічная праекцыя), спец. с... сабам графічнага адлюстравання рачаіс... (умоўныя знакі), адборкай і абагульнен... з'яў, якія адлюстроўваюцца (картаграфічная генералізацыя). К. г. класіфікуюцца па... зместу, маштабу, тэрытарыяльнага ахо... прызначэння. Паводле зместу падзяляю... на агульнагеаграфічныя і тэматычныя. Ў... ры тапаграфічнай, глебавай, геабат., геа... фал., кліматычнай картаў, карты насель... ва гл. на ўкл. Фізічную, геал., паліт., ... ка-адм., эканам., гістар., этнаграфічную і ... карты гл. ў тамах БелСЭ да арт. пра ... свету, дзяржавы, вобласці, вял. гістар. пу... і інш.

На агульнагеагр. картах адлюстроўваецца ра... еф, гідраграфія, расліннасць, нас. пункты, ... зносіны, дзярж. і адм. граніцы, аб'екты гіс... культ. значэнне. Паводле маштабу бываюць буд... маштабныя або тапаграфічныя (1 : 10 000, 1 : 25 ... 1 : 50 000, 1 : 100 000 і 1 : 200 000), сярэднемас... ныя або агляднка-тапаграфічныя (1 : 300 ... 1 : 500 000, 1 : 1 000 000), дробнамаштабныя ... аглядныя (драбней за 1 : 1 000 000). Тапаграф. ... ты даюць дакладнае і падрабязнае адлюстраван... мясцовасці, гэта — аснoўныя карты дзяржаў. ... матычныя карты на фоне аснoўных контураў ... ной паверхні паказваюць дадатковыя элемент... а'явы, якія часта не маюць на зямной повер... бачных контураў (западкі, шчыльнасць насельніц... ва, спецыялізацыя с. гасп. і інш.), паказ... унутр. асаблівасці (салёнасць марской вады), ... матычныя карты падзяляюцца на 3 групы: 1) ... ты прыродных з'яў, або фізіка-геаграфічныя (агул... ныя фізіка-геаграфічныя, геалагічныя, клімат... ныя, глебавыя, расліннасці, ральефу — геамарфа... гічныя і гіпсаметрычныя, жывёльнага свету, ... награфічныя, ландшафтныя, прыроднага раянав... ня і інш.); 2) карты грамадскіх з'яў, або сацыя... на-эканамічныя, эканамічныя (насельніцтва, ... літыка-адміністрацыйныя, культуры, навукі, ... здароўя, гістарычныя і інш.); 3) карты тэхніч... выкарыстоўваюцца на транспарце, буд-ве, у пр... мысловасці і с. гаспадарцы. Паводле прызна... К. г. падзяляюцца на навучальныя, даведачн... марскія, аэранавігацыйныя, дарожныя, турыст... Па тэрыторыі ахопу — на касмічныя, сусветн... мораў і акіянаў, мацерыкоў і іх вял. частак, ... жаў, абласцей, раёнаў. Паводле тыпу — на пл... выя або прыватныя (тэмпературы, ціску, асобн... галін прамысл., с. гасп.); сінтэтычныя, якія ... рактарызуюць з'яву як адзінае цэлае на асно... злучэння і аліцця пэўных паказчыкаў; компле... ныя, якія паказваюць некалькі з'яў з уліку ... емасувязей (сінаптычныя карты).

К. г. ствараюцца з дапамогай здымкі (тап... графічнай, аэрафотатапаграфічнай, касм... най) або камеральным шляхам у выніку апрацоўкі і сінтэзу разнастайных крыні... К. г. выкарыстоўваюцца як даведнікі на мя... цовасці, як дапаможнікі школьнага і пазашкольнага навучання, з дапамогай іх вызначаецца прагноз з'яў, неабходных пры рашэнні нар.-гасп. і навуковых задач. Найчасцей на аснове К. г. складаюцца *картаграмы, картадыяграмы, картасхемы.*

Літ.: Гл. пры арт. *Картаграфія.*

В. Я. Крышчановіч. Мінск.

КАРТЫЗОЛ, лякарства, тое, што *ізідакартызон.*

КАРТЫЗОН, гарманальны лекавы прэпарат з групы *кортыкастэроідаў.* Выпускаюць у парашках, таблетках, суспензіях. Ужываюць ацэтат К. як процізапаленчы і антыалергічны сродак (адысонава хвароба, недастатковая функцыя кары надныракавікаў, рэўматызм, бранхіяльная астма, лейкозы). Проціпаказ...



ТАПАГРАФІЧНАЯ КАРТА Маштаб 1:25 000



ГЛЕБАВАЯ КАРТА Маштаб 1:17 000 000



КАРТА РАСЛІННАСЦІ Маштаб 1:17 000 000



ГЕАМАРФАЛАГІЧНАЯ КАРТА Маштаб 1:17 000 000



КЛІМАТЫЧНАЯ КАРТА Маштаб 1:2 400 000



КАРТА ШЧЫЛЬНАСЦІ НАСЕЛЬНІЦТВА Маштаб 1:30 000 000

Карта складзена і афармлена ў студзені 1972 г.
Падпісана да друку 17 мая 1972 г.



заны пры цукр. дыябеце, гіпертанічнай хваробе, язвавай хваробе страўніка, цяжарнасці.

КАРТЫРО́Н, лякарства, тое, што *дэзоксікортыкастэрон-ацэтат*.

КАРТЭ́ЛЬ (франц. cartel ад італьян. cartello), адна з асноўных формаў капіталіст. *манаполій*, аб'яднанне капіталістаў, якія заключаюць пагадненне на вытворчасць і збыт прадукцыі, на цэны, умовы найму рабочай сілы, абмен патэнтамі, падзел рынкаў збыту для атрымання найбольшага прыбытку. Прадпрыемствы, аб'яднаныя ў К., захоўваюць сваю камерцыйную і гасп. самастойнасць. Прадугледжваецца доля (квота) кожнага ўдзельніка К. ў агульным аб'ёме вытворчасці ці збыту і ўтварэнне агульнага фонду прыбыткаў (пул). Як і інш. аб'яднанні — трэсты, канцэрны, сіндыкаты,— з'яўляюцца характэрнай рысай імперыялізму. Побач з К. асобных краін існуюць міжнародныя (гл. *Міжнародныя манаполіі*).

КАРУ́ЗА (Caruso) Энрыка (25.2.1873, Неапаль — 2.8.1921), італьянскі спявак (лірыка-драм. тэнар). Адзін з выдатных прадстаўнікоў італьян. вак. стылю бельканта. Дэбютаваў у 1894, выступаў у многіх краінах (у Расіі ўпершыню ў 1898). Выконваў асн. лірычныя, лірыка-драм., з 1908—09 выключна драм. партыі тэнаровага рэпертуару.

Літ.: Торторелли В. Энрико Карузо, пер. с итальян., М., 1965.

КАРУ́НД, мінерал, вокіс алюмінію, прыродны бязводны гліназём Al_2O_3. Высакаякасны абразіў і вогнетрывалы матэрыял. Празрыстыя разнавіднасці выкарыстоўваюць у дакладным прыладабудаванні, у квантавых генератарах (лазерах), у ювелірнай справе.

Змяшчае 53% Al, прымесі Cr, Fe, Ti. Крышталізуецца ў трыганальнай сістэме, крышталі шасцігранныя, выцягнутыя ці плоскія, таблітчастыя. Часцей трапляецца ва ўкрапаніках і зярністых масах. Колер сіпявата- ці жаўтавата-шэры. Каштоўныя празрыстыя разнавіднасці — *рубін* (чырвоны), *сапфір* (сіні), лейкасапфір (бясколерны). Бляск шкляны. Цв. 9,0; шчыльн. 3950—4100 кг/м³. Паходжанне пераважна метамарфічнае; трапляецца ў россыпях. Атрымліваюць і штучна. Радовішчы ў СССР, Канадзе, Паўд. Афрыцы, Індакітаі.

КАРУ́НКІ, ажурныя, сеткавыя вырабы з ільняных, шаўковых, металічных і інш. нітак; від дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. У залежнасці ад тэхнікі выканання К. падзяляюцца на ручныя (плеценыя на каклюшках — точаных палачках; шытыя іголкай, вязаныя кручком або пруткамі) і машынныя. Вядомыя ў Ст. Егіпце, Грэцыі і інш. краінах, у Кіеўскай Русі з 13 ст. У 15 — пач. 17 ст. пашыраны ў Італіі (Венецыя, Мілан) К.-гіпюр, якімі ўпрыгожвалі каўняры, манжэты, пальчаткі, адзенне духавенства. У канцы 17 ст. ў Генуі вырабляліся К. з пазалочаных і сярэбраных нітак для ўпрыгожвання адзення, мэблі, карэт і інш. У Фландрыі існавала вытворчасць плеценых К. з брабанцкага лёну (Бенш, Валансьен). У канцы 17 — пач. 18 ст. ствараюцца цюлевыя К. («англетэр» у Бруселі, «дзюшэс» у Бругу, «брабанцкія» і «малін»). У 18 ст. цэнтрам вытворчасці К. становіцца Францыя (седанскі гіпюр і алансон, «аржант» — К. на цюлі, чорныя шаўковыя з Шантылі і інш.). У Іспаніі вырабляліся чорныя шаўковыя К. з залатымі ніткамі, у Ірландыі вязаныя кручком (19 ст.). З 30-х г. 19 ст. пашырылася машынная вытворчасць К. на цюлі з баваўняных нітак і інш.

У Расіі былі пашыраны пазалочаныя і сярэбраныя К., якімі ў 2-й пал. 16 ст. ўпрыгожвалася царскае адзенне. У 17 ст. вырабляліся ў царскіх майстэрнях. Баяры і купцы ўпрыгожвалі К. адзенне, ложкі, люстэркі, карэты. Пасля рэформы адзення, праведзенай Пятром I, пашырыліся льняныя і шаўковыя К. Іх выраблялі прыгонныя ў майстэрнях. У 18 ст. складваюцца цэнтры карункапляцення з ярка выражанымі мясцовымі асаблівасцямі (Таржок, Ялец, Мцэнск; Галіч Кастрамской вобл., Волагда, Разань і інш.). Тут вырабляліся К. на продаж, у т. л. і на сусв. рынак (мануфактура Пратасавай Мцэнскага пав. Арлоўскай губ.).

На Беларусі К. вядомы з 13—14 ст.— на адзенні князёў і царкоўнікаў. Пры манастырах, а з 18 ст. ў панскіх маёнтках, існавалі майстэрні, дзе выраблялі К. з залатых і сярэбраных нітак, пазней з шаўковых і баваўняных. З 18 ст. К., якія ўпрыгожвалі касцюмы магнатаў, найчасцей былі прывазныя — французскія, нямецкія і інш. У 2-й пал. 18 ст. па ініцыятыве падскарбія Вял. кн. Літ. А. Тызенгаўза ў Гарадніцы (прадмесці Гродна) засн. прыгонная мануфактура, дзе вырабляліся К. па замежных узорах (французскіх, нямецкіх) для вяльможаў. Існавала ядоўга. На Беларусі найболей вязалі і плялі К. драўлянымі, а пазней метал. кручкамі. Быў вядомы стараж. спосаб пляцення на каклюшках — «вылічальны», заснаваны на паўтарэнні аднаго малюнка з дапамогаю вылічэння нітак без гатовага ўзору. Вылічальныя К. з роўнымі краямі вырабляліся сяллянамі на ўпрыгожванне адзення, фартухоў, каўняроў, ручнікоў і інш. Узоры нар. К. маюць шмат агульнага з узорамі нар. тканін і вышывак.

Карункі. Уверсе: венецыянскія шытыя. 18 ст. Італія (злева). Валагодскія плеценыя. Унізе: беларускія плеценыя.



Беларускім К. характэрны геаметрычныя («ромбы», «шахматы», «палоскі») і раслінныя ўзоры («кветкі», «зорачкі», «сняжынкі» і інш.).

Літ.: Русское декоративное искусство, т. 1—3, М., 1962—65; Бирюкова Н. Ю. Западноевропейское кружево XVI—XIX в. в собрании Эрмитажа, Л., 1959; Давыдова С. А. Русское кружево и русские кружевницы, СПб., 1892; Беларускае народнае мастацтва, т. 1, Мн., 1951.

І. М. Паньшына, Д. С. Трызна. Мінск.

КАРУПЦЫЯ (лац. corruptio), у капіталіст. краінах прадажнасць дзярж. і паліт. дзеячаў і чыноўнікаў дзярж. апарату.

КАРУСЕ́ЛЬНЫ СТАНО́К, металарэзны станок з верт. воссю шпіндэля і вярчэннем у гарыз. плоскасці планшайбы з дэталлю, што апрацоўваецца. Прызначаны для апрацоўкі дэталяў вялікага дыяметра і параўнаўча невялікай таўшчыні (махавікі, дыскі, карпусы буйных эл. машын і г. д.). На К. с. можна апрацоўваць вонкавыя і ўнутраныя паверхні, свідраваць, зенкераваць і рабіць разьбу ў адтулінах, размешчаных па восі вярчэння дэталі.



К. с. выпускаюцца аднастоечныя з дыяметрам планшайбы да 1,6 *м* і двухстоечныя з большымі планшайбамі для апрацоўкі дэталяў дыяметрам да 16 *м* і больш. Асн. вузлы станка (гл. рыс.): станіна з стойкай *1*, стол (планшайба) *2*, папярочнік (траверса) *4*, верт. супарт *3* з пяцігранай рэвальвернай галоўкай, бакавы супарт *6*, прывод планшайбы *7*, механізмы падачы супартаў *5*. К. с. характэрны наступныя рухі: вярчэнне планшайбы з дэталлю (галоўны рух); гарыз. перамяшчэнне верт. супарта па траверсе (гарыз. падача); верт. перамяшчэнне карэткі з рэвальвернай галоўкай таго ж супарта (верт. падача); верт. перамяшчэнне бакавога супарта (верт. падача); гарыз. перамяшчэнне паўзуна бакавога супарта (гарыз. падача) і хуткія халастыя перамяшчэнні бакавога супарта, траверсы і рэвальвернай галоўкі (установачныя рухі).

Літ.: Ачеркан Н. С. и др. Металлорежущие станки, т. 1, 2 изд., М., 1965; Тепинкичиев В. К. и др. Металлорежущие станки, М., 1970.

М. Ю. Пікус. Мінск.

КАРФАГЕ́Н (з фінікійскага Qarthadašt Новы горад), найбуйнейшы рабаўладальніцкі горад-дзяржава ў Паўн. Афрыцы ў 7—2 ст. да н. э. Засн. на ПнУ сучасн. Туніса выхадцамі фінікійскага г. Тыра ў 825—814 да н. э., К. стаў цэнтрам пасрэдніцкага гандлю паміж усх. і зах. Міжземнамор'ем.

Развіццё гандлю спрыяла заснаванню К. калоній уздоўж узбярэжжа і на астравах Зах. Міжземнамор'я. Паступова К. расшырыў свае вямельныя ўладанні ў басейне р. Баград. Тут узніклі латыфундыі з працай рабоў і туземнага насельніцтва. У К. склалася рабаўладальніцкая алігархічная рэспубліка. Пануючы клас — землеўладальнікі і гандляры. Заканадаўчую ўладу меў Сенат (складаўся з найбольш багатых грамадзян). На чале выканаўчай улады 2 суфеты (перавыбіраліся штогод). Насельніцтва падпарадкаваных К. гарадоў пастаўляла К. воінаў. Значную вагу ў арміі мелі наёмнікі. Супярэчнасці паміж аграрнай і гандл. групамі рабаўладальніцкага класа аслаблялі К. З 6 ст. да н. э. прэтэндаваў на першынство ў мараплаванні і гандлі Зах. Міжземнамор'я, вёў упартую барацьбу з грэч. каланістамі. У сярэдзіне 5 ст. падначаліў лівійскае насельніцтва Паўн. Афрыкі. Дзяржава, створаная К., уключала Паўн. Афрыку, Зах. Сіцылію, Паўд. Іспанію, Сардзінію. Каля трох стагоддзяў К. змагаўся за захоп грэч. калоній на в-ве Сіцылія. Імкненне да гегемоніі прывяло да т. зв. *Пунічных войнаў* 264—146 да н. э. з Рымам. У выніку 3-й Пунічнай вайны 149—146 К. захоплены і разбураны рымлянамі. У 1 ст. да н. э. адноўлены, у перыяд Рым. імперыі адзін з вялікіх гарадоў Міжземнамор'я, у 5—7 ст. пад уладай вандалаў, Візантыі. У 698 разбураны арабамі.

Літ.: Тураев Б. А. История Древнего Востока, т. 1—2, 2 изд., Л., 1936; Машкин Н. А. Карфагенская держава до Пунических войн, «Вестник древней истории», 1948, № 4; яго ж. Последний век пунического Карфагена, там жа, 1949, № 2.

Ф. М. Нячай. Мінск.

КАРЦА́Н Ян (Ioannes Velicensis; г. н. невяд.— каля 1611), друкар і кнігавыдавец на Беларусі і ў Літве канца 16 — пач. 17 ст. У 1576—80 друкар замкавай друкарні магната Яна Кішкі ў мяст. Лоск каля Маладзечна. Надрукаваў 7(8) кніг на польскай і лац. мовах, у т. л. твор С. Буднага «Пра найважнейшыя артыкулы хрысціянскай веры» (1576). У 1580—1611 уладальнік друкарні ў Вільні, у якой было выдадзена больш за 100 кніг на польскай, лац. і грэч. мовах, у т. л. зборнікі выслоўяў і кароткіх апавяданняў з жыцця выдатных людзей старажытнасці — «Апафегматы» (1599) у 4 кнігах, падрыхтаваных да друку асветнікам Б. Будным, паэма Яна Казаковіча «Арэх валошскі» (1603), творы ант. аўтараў, палемічныя выданні, падручнікі і мед. дапаможнікі. Пасля смерці К. ўладальнікам друкарні стаў яго сын Іосіф Карцан.

Літ.: Анушкин А. На заре книгопечатания в Литве, Вильнюс, 1970, с. 80—112; Drukarze dawnej Polski od XV do XVIII wieku, z. 5, Wrocław—Kraków, 1959, s. 107—115.

Г. Я. Галенчанка. Мінск.

КАРЦЕ́Ч (ад італьян. cartoccio літар. патрон), 1) снарад, начынены сферычнымі кулямі з сплаву свінцу і сурмы, прызначаны паражаць жывую сілу праціўніка на адлегласці да 300 *м* (гл. таксама *Шрапнель*). 2) Буйны шрот дыяметрам 6—10 *мм* для паляўнічага ружжа.

КАРЦІ́НА, твор станковага жывапісу, які мае самастойнае мастацкае значэнне і закончаны характар.

У адрозненне ад інш. відаў жывапісных твораў К. не звязана з пэўным месцам і якім-н. дэкар. ці утылітарным прызначэннем. Пашырылася ў эпоху Адраджэння (у Расіі з 17 ст.), выцесніўшы абразы. У К. найб. поўна можа быць паказаны ўнутраны свет чалавека, яго дзейнасць, узаемасувязь з інш. людзьмі, прыродай. З паяўленнем К. развіліся розныя жанры жывапісу: бытавы, гістарычны, батальны, партрэт, пейзаж, нацюрморт. Іл. гл. на ўклейках да арт. *Жывапіс* і арт. пра жанры.

КАРЦІ́ННАЯ ГАЛЕРЭ́Я, мастацкі музей, у якім сабраны выключна (ці пераважна) творы жывапісу. К. г. таксама наз. раздзелы жывапісу ў вял. музеях, залы для збораў карцін у палацах (у Паўлаўску, Гатчыне), некаторыя прыватныя зборы (у мінулым Траццякоўская галерэя, Галерэя Піты ў Фларэнцыі). Назву К. г. меў да 1957 Бел. дзярж. маст. музей.

КАРЦЭ́ВІЧЫ, вёска ў Нясвіжскім р-не Мінскай вобл., каля р. Уша. Цэнтр сельсавета.

За 6 *км* на ПдЗ ад Нясвіжа, 118 *км* ад Мінска, 20 *км* ад чыг. ст. Гарадзея, каля шашы Нясвіж — Баранавічы (3 *км*). 440 ж., гасп. 133 (1971). Васьмігадовая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі, магазін.

КАРЦЭ́Я, возера ў бас. Зах. Дзвіны, у Міёрскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 0,50 *км*². Даўж. 0,9 *км*, найб. шыр. 0,7 *км*, сярэдняя 0,56 *км*. Катлавіна круглявая. Вадазбор (3,75 *км*²) раўнінны. Сцёк з К. ў рэкі Паловіцу і Стуканаўку. Водзяцца шчупак, акунь, плотка, верхаводка.

КАРЧАВА́ЛЬНІК, трактар з навясным абсталяваннем, прызначаны выдаляць з глебы карчы, дрэвы і хмызнякі. Можа выкарыстоўвацца і для рыхлення шчыльных грунтоў.

Навясное абсталяванне складаецца з рамы, рашоткавага адвала, рыхлільных зубоў, гідраўлічнай ці тросаблочнай сістэм кіравання. Для карчавання на тарфяных аблогах часта выкарыстоўваюцца экскаватары, абсталяваныя крукамі, прычапныя К. з крукамі і ротарныя К. з ручным ці аўтаматычным выкідваннем карчоў.

КАРЧА́ГА, у Ст. Русі (10—12 ст.) вялікая гліняная пасудзіна з вострым, закругленым ці амаль плоскім дном, вузкім горлам і дзвюма дугападобнымі ручкамі. Формаю падобная на стараж. *амфару*.

У К. хавалі і перавозілі віно, мёд, збожжа, алей. Рэшткі К. знойдзены пры раскопках амаль усіх стараж. бел. гарадоў, найбольш пры раскопках Навагрудка. На К. часам трапляюцца знакі, літары або цэлыя словы (гл. *Графіці*). К. называюць таксама вялікую, звычайна гліняную пасудзіну, якая выкарыстоўваецца ў гаспадарцы.



Карчага з Навагрудка. 13 ст. Дзярж. музей БССР.

Літ.: Малевская М. В. Амфоры Новогрудка XII— XIII вв., у кн.: Тезисы докладов к конференции по археологии Белоруссии, Мн., 1969; Равдина Т. В. Надпись на корчаге из Пинска, «Краткие сообщения о докладах и полевых исследованиях Ин-та истории матер. культуры АН СССР», 1957, в. 70.

Я. Г. Зверуга. Мінск.

КАРЧМА́, харчэўня, заезны двор. Вядомая з часоў Кіеўскай Русі. На Беларусі была пашырана ў 14—19 ст.

Багатыя К. *(аўстэрыі)* звычайна ставіліся ў вял. гарадах, на скрыжаваннях гандл. шляхоў і былі разлічаны на вышэйшыя саслоўі. Выконвалі функцыі гасцініц, там звычайна адбываліся гандлёвыя і ліхвярскія здзелкі. Мураваныя гарадскія К. мелі вял. памеры, два паверхі (на 1-м — зала і кухня, на 2-м — жылыя пакоі). К. ў мястэчках, сёлах, вёсках, фальварках — т. зв. карчомкі, манапольні — служылі заезнымі дварамі, у якіх прадаваліся стравы, квас, піва, віно, з 2-й пал. 16 ст.— гарэлка. Вясковая К. канструкцыяй, выглядам і планіроўкай падобна да хаты. Большыя К. былі 2 тыпаў: першы меў жылую частку пасярэдзіне і па баках стайні, якія накрываліся адным дахам, у другім — стайня і інш. памяшканні ставіліся ў адну лінію і стваралі франтальную кампазіцыю. К. на вялікіх дарогах у 18 — пач. 19 ст. заменены паштовымі станцыямі і гасцініцамі. Невял. К. існавалі ў бел. вёсках да пач. 20 ст. К.— сродак эксплуатацыі працоўных і ажыццяўлення дзярж. манаполіі на продаж гарэлкі. У нар. творчасці і маст. л-ры карчмары былі аб'ектам сац. крытыкі і асмейвання за вымагальніцтва, ліхвярства, спекуляцыю і эксплуатацыю працоўных.

КАРЧО́ВА, вёска ў Баранавіцкім р-не Брэсцкай вобл., каля р. Сэрвач (1 *км*). Цэнтр сельсавета і калгаса «Бальшавік». За 35 *км* на Пн ад Баранавіч, 241 *км* ад Брэста. 413 ж., двароў 123 (1971). За 1,5 *км* ад К. цагельня. Камбінат быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, урачэбна-вет. ўчастак, аддз. сувязі, магазін. Помнік на брацкай магіле 55 сав. воінаў, партызан і землякоў, якія загінулі ў Айч. вайну.

КАРЧЭ́ЎСКІ Юльян (снеж. 1806, Ашмяны — студз. 1833), жывапісец-жанрыст. Яго творчасць звязана з маст. жыццём Літвы, Беларусі і Польшчы. Вучыўся на філас. ф-це Віленскага ун-та, дзе адначасова займаўся жывапісам у Я. Рустэма. У 1824 вывучаў права ў Пецярбургскім ун-це (з 1826 кандыдат права). Створаныя ім жанравыя кампазіцыі («Руская хуткая пошта», «Яўрэйскае пахаванне» і інш.) вызначаліся тэхнічнай дасканаласцю, вастрынёю характарыстык, дакладным паказам нац. тыпаў. У 1829 пераехаў у Рым, дзе напісаў шэраг пейзажаў і жанравых сцэн. Яго карціны «Ян III пад Венай», «Турак на кані» і інш. ў 2-й пал. 19 ст. зберагаліся ў галерэі А. Храптовіча ў Шчорсах.

Л. Н. Дробаў. Мінск.

КАРШУКО́Ў Яўген Іванавіч (н. 4.2.1932, в. Давыдавічы Даманавіцкага р-на), беларускі савецкі пісьменнік. Чл. КПСС з 1959. Сын настаўніка. Скончыў БДУ (1956). Працаваў журналістам, у 1959—71 рэдактар Гомельскай студыі тэлебачання. З 1971 у рэдакцыі газ. «Літаратура і мастацтва». Друкуецца з 1955. Аўтар зб. апавяд. «У дарогу» (1963), апавяд. і гумарэсак «Не без таго...» (1967), «Сустрэча» (1969), аповесці для дзяцей «Міцькаўскія змоўшчыкі» (1971).

КАРШУНО́Ў Андрэй Антонавіч [11(23).9. 1896, в. Смалянкі Слуцкага пав. Мінскай губ.— 11.9.1944], удзельнік грамадз. вайны, ген.-м. (1944). З сялян. Чл. КПСС з 1918. Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1928), Ваен. акадэмію Ген. штаба (1938). У Чырв. Арміі з 1918. У студз. 1919 — сак. 1922 на Паўн.-Зах. і Паўд. франтах — камандзір узвода, роты, батальёна; удзельнічаў у баях супраць Юдзеніча, Урангеля, бандаў Махно. У 1928—37 на адказных пасадах у штабе БВА, з 1938 выкладчык Ваен. акадэміі. У Айч. вайну нач. аддзела ваен. сувязей Паўд.-Зах., Паўд.-Усх., 1-га і 3-га Укр. і трох Прыбалтыйскіх франтоў. Узнаг. 4 ордэнамі, медалямі.

КАРШУНЫ́ (Milvus), род драпежных птушак сям. ястрабіных. У СССР 2 віды. На Беларусі абодва: чорны К. (M. korschun) і чырвоны К. (M. milvus). Карысныя лясной і с. гасп., ахоўваюцца.

Даўж. цела чорнага К. 40—50 *см*, маса 800—1100 *г*. Самкі большыя за самцоў. Апярэнне цёмна-бурае, хвост доўгі, вільчаты. Гняздуецца на высокіх дрэвах. Нясе 2—4 яйцы. Корміцца дробнымі грызунамі, птушкамі, жабамі. Пералётная птушка. Даўж. цела чырвонага К. каля 60 *см*, маса 1000—1300 *г*. Агульны тон апярэння чырванаватарыжы. Біялогіяй нагадвае чорнага К. Трапляецца рэдка. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Драпежныя птушкі*.

Літ.: Гл. пры арт. *Драпежныя птушкі*.

Б. З. Галадушка. Мінск.

КАРШЫ, горад, цэнтр Кашкадар'інскай вобл. Узб. ССР, на р. Кашкадар'я. Узнік на шляху караванаў у Індыю, Самарканд і Бухару. Чыг. вузел. 74 тыс. ж. (1971). Бавоўнаачышчальны, алейнаэкстракцыйны, масларобчы, маторарамонтны, цагельны з-ды; швейная ф-ка; мясакансервавы і хлебны камбінаты. Прадпр. па вытворчасці буд. матэрыялаў і абслугоўванні чыг. транспарту. Пед. ін-т; 6 сярэдніх спец. навуч. устаноў. Муз.-драм. тэатр.

КАРЫБСКАЕ МОРА, Караібскае мора (Caribbean Sea), паўзамкнёнае мора Атлантычнага ак. паміж Цэнтр., Паўд. Амерыкай, Вялікімі і Малымі Антыльскімі а-вамі. Пралівамі Наветраны і Мона злучаецца з Атлантычным ак., Юкатанскім з Мексіканскім залівам, Панамскім каналам з Ціхім ак. Пл. 2754 тыс. км². Найб. глыб. 7680 м (жолаб Кайман), сярэдняя 2491 м.

Берагавая лінія моцна парэзаная; на З і Пд залівы Гандураскі, Маскітас, Венесуэльскі і інш. Шмат каралавых рыфаў. Клімат трапічны. Сярэдняя т-ра вады на паверхні 26 (люты), 28 °С (жн.). Салёнасць каля 36‰. Праз К. м. з У на З праходзіць Карыбскае цячэнне. Водзяцца акулы, лятучыя рыбы, марскія чарапахі; трапляюцца кашалоты і гарбатыя кіты, каля в-ва Ямайка цюлені і ламанціны. Найб. порты: Маракайба (Венесуэла), Баранкілья (Калумбія), Калон (Панама), Сант'ягадэ-Куба (Куба), Ла-Гуайра (Венесуэла).

КАРЫЕС ЗУБОЎ (лац. caries гніенне), кастаеда, хвароба зубоў з разбурэннем іх эмалі і дэнціну (гл. *Зубы*).

У аснове К. з.— парушэнне харчавання зуба і пластача ў арганізме некат. бялкоў, вітамінаў і соляў (пераважна фтору). Пашраны больш як у 90% людзей. Прыметы: растварэнне цвёрдых тканак зуба, утварэнне поласцей, запаленне пульпы (пульпіт). Лячэнне: выдаленне пашкоджаных тканак, пламбаванне. Прафілактыка: рацыянальнае харчаванне (з дастатковай колькасцю бялкоў, вугляводаў, тлушчаў, соляў і вітамінаў).

Літ.: Лукомский И. Г. Кариес зуба, М., 1948; Дауге П. Г. Социальные основы советской стоматологии, М., 1933; Мятліцкі Ю. К. і Перкаль К. І. Хваробы зубоў, поласці рота і іх папярэджанне. Мн., 1958; Рыбаков А. И. и Гранин А. В. Вопросы патогенеза, патогенетической профилактики и терапии кариеса зубов на ранних стадиях, М., 1970.

Ю. К. Мятліцкі. Мінск.

КАРЫКАТУРА (італьян. caricatura ад caricare перагружаць, перабольшваць), выява, якая наўмысна падкрэслівае і камічна перабольшвае адмоўныя асаблівасці аб'екта, каб іх асмяяць і выкрыць; жанр выяўл. мастацтва, адна з самых пашыраных формаў *сатыры*. Выконваецца пераважна сродкамі графікі (ёсць жывапісныя і скульптурныя К.), вялікая роля належыць суправаджальнаму тэксту.

Элементы К. вядомы ў мастацтве Ст. Егіпта, ант. свету, сярэдневякоўя і эпохі Адраджэння. Як жанр склалася ў перыяд капіталізму. Была пашырана ў форме лубка (Расія, Кітай). У газетах і часопісах К. здаўна служыць ідэалагічнай зброяй у класавай і нац.-вызв. барацьбе. Найб. яе росквіт прыпадае звычайна на перыяд рэвалюц. уздыму. Выдатная роля ў развіцці сусв. К. належыць У. Хогарту, Дж. Гілрэю, Т. Роўлендсану (Англія), Ф. Гоі (Іспанія), А. Дам'е, П. Гаварні (Францыя), Г. Цыле, Г. Гросу (Германія), І. Церабянёву, А. Венецыянаву, В. Сярову, Б. Кустодзіеву (Расія). Сярод праграс. зарубежных майстроў К.— Р. Майнар, Ф. Эліс, У. Гропер (ЗША), Ж. Эфель (Францыя), Х. Бідструп (Данія), Г. Зандберг (ГДР), Э. Ліпінскі (Польшча), Н. Тоніца (Румынія), Майстры сав. К. (В. Дэні, Дз. Маор, У. Маякоўскі, М. Чарамных, Кукрыніксы, Б. Яфімаў, Б. Праворкаў, Л. Сайферціс, І. Слмёнаў, А. Азімзадэ, В. Літвіненка) стварылі востра выразную К., якая выкрывае контррэвалюцыю, фашызм, міжнар. рэакцыю; бічуе пережыткі капіталізму ў быце і свядомасці сав. людзей.

Сатыр. малюнкаў бел. мастакоў 19 ст. зберагліся мала [цыклы карыкатур А. Бартэльса, К. Каганца (Кастравіцкага)]. У 1918—19 у газ. «Бедняк» друкаваліся К. ананімных аўтараў. З паліт. К. выступаў у прагрэс. друку Зах. Беларусі Я. Горыд. У 30-я г. ў жанры К. пачынае працаваць М. Гурло, у час Айч. вайны многія бел. сав. мастакі змяшчаюць сатыр. малюнкі ў агітплакаце «Раздавім фашысцкую гадзіну» і час. «Партызанская дубінка» (В. Букаты, Г. Вальк, Д. Дубінскі, Я. Зайцаў, В. Козак, Дз. Красільнікаў, А. Шаўчэнка). Шэраг К. створаны мастакамі-партызанам М. Гуціевым. Актыўна працуюць у час. «Вожык» М. Гурло, С. Раманаў і інш. Сярод карыкатурыстаў 50—60-х г.— Е. Ганкін, Р. Грамыка, В. Жданаў, М. Лісоўскі, З. Паўлоўскі, А. Чуркін, Л. Чурко, В. Швяцоў і інш. Ілюстр. гл. на ўклейцы.

Літ.: Ефимов В. Е. Основы понимания карикатуры, М., 1961; Стыкалин С. и Кременская И. Советская сатирическая печать. 1917—1963, М., 1963; Стернин Г. Очерки русской сатирической графики, М., 1964; Орлова М. А. Искусство Советской Белоруссии, М., 1960; Шматаў В. Ф. Беларуская сатырычная графіка. Мн., 1971; Лісоўскі М. і Барадулін Р. Няўрокам кажучы, Мн., 1971.

І. М. Паньшына (бел. раздзел). Мінск.

КАРЬЙЛЬЁ (Carrillo) Сант'яга (н. 18.1.1915, г. Хіхона, прав. Астурыя), дзеяч іспанскага і міжнар. рабочага і камуніст. руху. З сям'і рабочага. У 1928—36 у Федэрацыі сацыяліст. моладзі, з 1936 у Аб'яднаным саюзе сацыяліст. моладзі Іспаніі. У 1936—39 ген. сакратар Саюза. Чл. кампартыі Іспаніі (КПІ) з 1936. З 1937 чл. ЦК КПІ. Пасля паражэння іспарэспублікі (1939) эміграваў. З 1945 чл. Палітбюро (з 1960 Выканкома), з 1954 чл. сакратарыята ЦК КПІ. З 1959 ген. сакратар КПІ. Удзельнічаў у маскоўскіх Нарадах камуніст. і рабочых партый 1957, 1960 і 1969.

Тв.: Рус. пер.— После Франко — что? Испания: действительность и перспективы, М., 1966.

КАРЫМ Мустай (сапр. Карымаў Мустафа Сафіч; н. 20.10.1919, в. Кляшава Караякуфаўскай воласці Уфімскай губ.), башкірскі сатаўскай воласці Уфімскай губ.), башкірскі сатаўскай воласці Уфімскай губ.), башкірскі сат

Луцка, Бродаў, Перамышля. 19—20.9.1944 у баях за выхад на чэхаславацкую граніцу байцы эскадрона захапілі 2 варожыя батарэі, 7 аўтамашын з ваен. грузамі, адбілі каля 10 контратак, тройчы ўступалі ў рукапашны бой. Загінуў у баі. Яго імем названа вуліца ў Мінску.

КАРБЫЧНАЕ ДРЭВА, прамысловая назва некалькіх трапічных дрэў з роду карычных (Cinnamomum) сям. лаўровых. Найб. каштоўныя 2



Карычнае дрэва цэйлонскае: *1* — галінка з лісцем і кветкамі; *2* — кветка.

віды: К. д. цэйлонскае (C. zeylanicum) і К. д. кітайскае (C. cassia), якія культывуюцца пераважна на Цэйлоне, Зондскіх а-вах, у Паўд. Кітаі; у СССР — у субтропіках Грузіі. Высушаная кара К. д.— *карыца.*

Дрэвы або вялікія кусты. Лісце скурастае. Кветкі дробныя жаўтавата-зялёныя або белаватыя, сабраныя ў мяцёлкі. Плод — ягада.

Літ.: Вульф Е. В. и Малеева О. Ф. Мировые ресурсы полезных растений, Л., 1969.

КАРЫЯЛІСА СІЛА, гл. ў арт. *Сілы інерцыі.*

КАРЫЯТ (г. п. і см. невяд.), навагрудскі князь з 1340, сын вял. князя Вял. кн. Літ. Гедыміна і рус. княгіні Евы. У 1349 па даручэнні вял. князя Альгерда вёў перагаворы з ханам Залатой Арды Джанібекам пра дапамогу ў вайне супраць маскоўскага кн. Сямёна. Быў выданы ханам маскоўскаму князю, выкуплены Альгердам. Яго сыны валодалі Падоллем.

Літ.: Хроника Быховца. М., 1966, с. 54, 56.

КАРЫЯТЫДА (грэч. karyátides літар. жрыца храма Артэміды ў мястэчку Карыях у Ст. Грэцыі), скульптурная выява жаночай фігуры, якая служыць апорай перакрыцця ў архітэктурным збудаванні.



Карыятыда з храма Эрэхтэён. Афінскі акропаль. Каля 420—406 г. да н. э.

КАРЫЯТЫП (грэч. karyon ядро), набор парных храмасомаў (дыплоідны набор), тыповы саматычным (няполавым) клеткам пэўнага арганізма.

К. адрозніваюцца паводле колькасці храмасомаў (напр., К. чалавека мае 46 храмасомаў (23 пары), каня — 66, аўса — 42 храмасомы), іх формы, абсалютнай і адноснай даўжыні, ліку другасных перацяжак, размеркавання храмаціну ў асобных храмасомах. К. бывае сіметрычны (складаецца з падобных паводле формы храмасомаў) і асіметрычны (назіраецца меншае падабенства паміж асобнымі храмасомамі). Асіметрыя ў большасці жывёл выражана мацней, чым у раслін. Эвалюцыя К. накіравана на памяншэнне ліку храмасомаў і павелічэнне іх асіметрыі ў выніку структурных перабудоў (інверсіі, транслакацыі).

Літ.: Лобашев М. Е. Генетика, Л., 1967.

КАРЭБЫ, вёска ў Дрыбінскім с/с Горацкага р-на Магілёўскай вобл., каля р. Проня (1,5 *км*). Цэнтр калгаса «Світанне». За 30 *км* на Пд ад Горак, 65 *км* ад Магілёва, 16 *км* ад чыг. ст. Цёмны Лес. 190 ж., гасп. 68 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, адд. сувязі, магазін.

КАРЭДЖА (Correggio; сапр. Антоніо Алегры; каля 1489 ці 1494, Карэджа, прав. Эмілія — каля 15.3.1534), італьянскі жывапісец Высокага Адраджэння. Працаваў у Карэджы і Парме. Зазнаў уплыў А. Мантэньі, Леанарда да Вінчы, Мікеланджэла. Выдатны каларыст. Жывапісу К. ўласцівы лёгкія жыццярадасныя вобразы, поўныя прыгажосці, пачуццёвасці, грацыі. Палажыў пачатак тыпу плафоннага роспісу з фігурамі ў аблоках, пададзенымі ў эфектных ракурсах, што стварала ілюзію прарыву купала. Яго дынамічныя кампазіцыі, якім уласцівы свабоднае размяшчэнне фігур, узбуджанасць, амаль афектацыя вобразаў, папярэднічалі барочным кампазіцыям 17—18 ст. Найб. сталая работа — роспіс у Пармскім саборы «Ушэсце Марыі» (1526—30). Стварыў шмат алтарных карцін: «Мадонна з св. Еранімам» (т. зв. «Дзень», каля 1528), «Пакланенне пастухоў» («Ноч», каля 1530).

КАРЭЙСКАЕ ПІСЬМО (кунмун ці хангыл, раней онмун), сучасная літарнаскладовая кар. пісьменнасць.

ㄱ к	ㅋ кх	ㅏ я	ㅐ яэ
ㄴ н	ㄷ тх	ㅓ о	ㅔ е
ㄷ т	ㅌ пх	ㅑ йо	ㅖ йе
ㄹ л(р)	ㅂ х	ㅗ о	ㅚ ве
ㅁ м	ㅍ кк	ㅛ ё	ㅟ ві
ㅂ п	ㄲ тт	ㅜ у	ㅘ ва
ㅅ с	ㅃ пп	ㅠ ю	ㅙ вэ
ㅇ н	ㅆ сс	ㅡ ы	ㅝ во
ㅈ ч	ㅉ чч	ㅣ і	ㅞ вэ
ㅊ чх	ㅏ а	ㅐ э	ㅢ ві

Створана ў 1444. Складаецца з 40 простых і састаўных літар (19 зычных, 21 галосная і дыфтонг), якія пры напісанні слоў камбінуюцца ў графічныя склады (лігатуры) з 2, 3 і 4 літар. Графічны склад зверху ўніз і справа налева (кітайскі тып). Пачынае пашырацца запіс тэксту ў радок злева направа і зверху ўніз (еўрапейскі тып).

КАРЭЙСКАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК, заснавана ў 1952 у Пхеньяне. У сістэме АН (1970) ін-ты: фізікі і матэматыкі, біялогіі, інж. мастацтва, аналізу, механізацыі і аўтаматызацыі, металургіі, паліва, геалогіі і геаграфіі, маш.-буд. індустрыі, атамнай энергіі; галіновыя ін-ты — агульнай хіміі, сілікатаў, арганічнай і неарганічнай хіміі і інш.; астр. абсерваторыя; філіял у Хамхыне.

КАРЭЙСКАЯ МОВА, мова карэйцаў, асноўнага насельніцтва Карэі. Карэйцы жывуць таксама ў СССР, КНР, Японіі і ЗША. На К. м. гаворыць каля 38 млн. чал.

Тыпалагічна К. м. блізкая да ўрала-алтайскіх моў, але генет. сувязі з гэтымі мовамі не даказаны. К. м. аглюцінатыўная. Вылучаецца 6 дыялектаў: кангн.-ўсх., паўн.-зах., цэнтр., паўд.-ўсх., паўд.-зах., дыялект в-ва Чэчжудо. Асн. асаблівасці К. м.: у фанетыцы — перавага дыфтонгаў над простымі галосным; у марфалогіі — наяўнасць спрагальных прыметнікаў (з дзеясловамі ўтвараюць разрад прадыкатываў), няма асабовых формаў дзеяслова, наяўнасць паслялогаў (а не прыназоўнікаў); у сінтаксісе — фіксаваны парадак слоў, прэпазіцыя залежнага слова, няма дапасавання, шырокае выкарыстанне дзеепрыметнікаў, дзеепрыслоўяў, інфінітываў і інш. замест злучнікаў і злучнікавых слоў, якіх няма ў К. м.

Літ.: Мазур Ю. Н. Корейский язык, М., 1960; Холодович А. А. Очерк грамматики корейского языка. М., 1954.

КАРЭЙСКІ ПРАЛІЎ, паміж п-вам Карэя і Японскімі а-вамі. Злучае Усх.-Кітайскае і Японскае моры. Даўж. 390 *км*, шыр. 180—220 *км*, найменшая глыб. на фарватэры 115 *м*. А-вамі Цусіма падзяляецца на 2 праходы: Усходні і Заходні.

КАРЭКТНЫЯ І НЕКАРЭКТНЫЯ ЗАДАЧЫ, класы матэм. задач пра вызначэнні лікаў, функцый і інш., якія адрозніваюцца ўласцівасцямі рашэнняў.

Задача наз. карэктнай, калі яе рашэнне існуе, прычым адзінае і ўстойлівае. Задача, якая не задавальняе гэтым умовам, наз. некарэктнай. Напр., сістэма алг. лінейных ураўненняў з нулявым вызначальнікам некарэктная, а з вызначальнікам, не роўным нулю,— карэктная [за выключэннем выпадку, калі элементы вызначальніка зададзены прыблізна і ёсць «блізкі» (у граніцах хібнасці) нулявы вызначальнік]. Умовы карэктнасці задачы вельмі натуральныя з пункту гледжання дастасаванняў матэматыкі, таму некарэктныя задачы доўгі час лічыліся пазбаўленымі фізічнага сэнсу і не вывучаліся. Аднак многія задачы геафізікі, аэра-, тэрма- і электрадынамікі, аптымальнага кіравання і інш.— некарэктныя. У апошнія гады некарэктныя задачы інтэнсіўна даследуюцца, знойдзены эфектыўныя ўстойлівыя метады іх лікавага рашэння. На Беларусі тэорыя некарэктных задач распрацоўваецца з 1965.

Літ.: Тихонов А. Н., Иванов В. К. и Лаврентьев М. М. Некорректно поставленные задачи, у кн.: Дифференциальные уравнения с частными производными, М., 1970. *А. А. Ліскавец.* Мінск.

КАРЭКТУРА (лац. correctura выпраўленне), 1) праверка і выпраўленне друкарскага набору, з дапамогаю якіх ў паліграфіі ўзнаўляюць тэкст і графічныя выявы. 2) Пробны адбітак з друкарскай формы, які звераны ці які трэба зверыць з арыгіналам. К. павінна выявіць памылкі і недакладнасці ў наборы і паказаць сістэмаю карэктарскіх знакаў, якім чынам іх паправіць у формах друкарскага набору.

Літ.: Рисс О. Беседы о мастерстве корректора, М., 1959; Былинский К. И. и Жилин А. Н. Справочная книга корректора, М., 1960.

Карэктура (адбітак тэксту з неабходнымі папраўкамі).



КАРЭЛІ (Corelli) Арканджэла (17.2.1653, Фузіньяна каля Равены — 8.1.1713), італьянскі скрыпач, кампазітар, педагог і дырыжор. Заснавальнік італьян. скрыпічнай школы. Развіў жанры старадаўняй санаты, дзе даў дасканалыя ўзоры канцэртнага скрыпічнага стылю, і канчэрта гроса — важнага этапа ў станаўленні класічнай арк. музыкі. Пісаў толькі для смыковых інструментаў: 48 трыосанат для дзвюх скрыпак і баса, 12 санат для скрыпкі і баса, 12 канчэрці гросі.

Літ.: Кузнецов К. и Ямпольский И. Арканджело Корелли, М., 1953; Раабен Л. Жизнь замечательных скрипачей, М.— Л., 1967.

КАРЭЛІН Васіль Мікалаевіч [н. 3(15).8.1897, г. Кіржач Пакроўскага пав. Уладзімірскай губ.], беларускі савецкі вучоны ў галіне заатэхніі. Д-р с.-г. н. (1960), праф. (1963). Чл. КПСС з 1946. Скончыў Маск. с.-г. акадэмію імя Ціміразева (1924). У 1930—36 вучоны спецыяліст Усесаюзнага НДІ жывёлагадоўлі, з 1945 у дзярж. інспекцыі па племянной справе, з 1950 заг. аддзела генетыкі і развядзення с.-г. жывёл Латв. НДІ жывёлагадоўлі і ветэрынарыі, з 1959 Бел. НДІ жывёлагадоўлі. У 1962—71 на кафедры заалогіі названочных біял. ф-та БДУ. Навук. працы па селекцыі с.-г. жывёл.

Тв.: Бурый латвийский скот, Рига, 1949; Значение искусственного осеменения в животноводстве, Мн., 1961; Совершенствование породы крупного рогатого скота методом разведения по линиям, Мн., 1962; Организация контроль-ассистентской службы в молочном скотоводстве, Мн., 1968.

КАРЭЛІН Канстанцін Максімавіч (н. ў крас. 1907, с. Каюга Кунгурскага пав. Пермскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). Чл. КПСС з 1931. У Чырв. Арміі з 1929. На фронце з 1941. Вызначыўся на тэр. Брагінскага р-на Палескай вобл. 15—16.10.1943 артполк пад камандаваннем К. фарсіраваў Дняпро і ў баі за плацдарм знішчыў 2 артбатарэі, 3 мінамётныя батарэі, 17 кулямётаў, 2 склады з боепрыпасамі, заглушыў агонь 14 арт. і мінамётных батарэй, 6 кулямётаў, рассеяў 2 палкі пяхоты праціўніка. Жыве ў Маскве.

КАРЭЛІН Пётр Пятровіч (н. 15.3.1923, в. Казарыная Верхатурскага пав. Пермскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). На фронце з 1941, разведчык. Вызначыўся ў Камарынскім р-не Палескай вобл. 27.9.1943 адным з першых фарсіраваў Дняпро, выявіў агнявыя кропкі ворага і выклікаў агонь нашай артылерыі. Адбіваючы контратакі, быў паранены, але не пакінуў поля бою. Жыве ў г. п. Верхняя Сінячыха Алапаеўскага р-на Свярдлоўскай вобл.

КАРЭЛІЦКІ РАЁН, у складзе Гродзенскай вобл. Утвораны 15.1.1940. Размешчаны на У вобл. Пл. 1,1 тыс. км². Нас. 46,4 тыс. чал. (1971). Па-



дзяляецца на 12 сельсаветаў; г. п. Мір. Цэнтр г. п. Карэлічы.

Значная частка раёна занята Нёманскай нізінай, на З адгор'і Навагрудскага ўзвышша, на ПдУ пласкахвалістая раўніна. Карысныя выкапні: З радовішчы торфу з агульнымі запасамі 40,9 млн. *т*, у т. л. радовішча Карэлічы — 28,1 млн. *т*; 5 радовішчаў мелу — 7,4 млн. *т*, у т. л. радовішча Радунь — 5,6 млн. *т*; 3 радовішчы цагельнай сыравіны — 1,4 млн. $м^3$, у т. л. радовішча Любна — 0,9 млн. $м^3$; 3 радовішчы буд. пяску — 0,8 млн. $м^3$. У межах раёна выяўлена жал. руда. Сярэдняя т-ра студз. —6,3, ліп. 17,8 °С. Ападкаў каля 660 *мм* за год. Вегет. перыяд 193 дні. Рэкі Нёман (сплаўны) і яго прытокі Уша і Сэрвач. Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (60%), дзярнова-падзолістыя часова залішне ўвільготненыя (8,8%), дзярнова-балотныя (5,8%), тарфяна-балотныя (5,9%), алювіяльныя (19,5%). З мінер. глебаў 67,8% суглінкавых, 24,2 супясчаных, 8% пясчаных. Якасная ацэнка глебаў у балах: ворных зямель 48 (цана бала 0,39 *ц/га* збожжа), кармавых угоддзяў 45, усіх с.-г. угоддзяў 47. Пад лесам каля 19% тэр. Насяляюць раён беларусы, ёсць палякі, рускія і інш. Сярэдняя

Выступленне мужчынскага хору калгаса імя Чырвоных партызан.





Вёска Вялікія Жухавічы.

шчыльн. 42,2 чал. на 1 $км^2$. Гарадскога нас. 13,6%.

Прамысловасць па перапрацоўцы мясцовай сыравіны. З-д масла і сухога малака, харчкамбінат, пякарня ў Карэлічах. 2 спіртзаводы (Мір, Варонча), каўбасны цэх, торфапрадпрыемства «Міранка». Камбінат быт. абслугоўвання, раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі і Мірскае спецыялізаванае аддз. Сельгастэхнікі (Карэлічы). У раёне 23 калгасы, 3 саўгасы і птушкафабрыка (1971).

Калгасы і іх цэнтры: імя Гастэлы *(Райца)*, імя Дзімітрова *(Вялікая Слабада)*, імя Дзяржынскага *(Вышкава)*, «За мір» *(Аюцавічы)*, «Зара» *(Кайшоўка)*, імя Калініна *(Малюшычы)*, імя Я. Коласа *(Міратычы)*, «Ленінскі шлях» *(Цырын)*, «Маяк» *(Туварава)*, «Нёман» *(Любна)*, «Новае жыццё» *(Заполле)*, «Перамога» *(Вялікія Жухавічы)*, «1 Мая» *(Сімакава)*, «Расія» *(Уша)*, імя Суворава *(Некрашэвічы)*, «Сцяг Леніна» *(Лукі)*, «Сцяг перамогі» (Баранавічы), «Сцяг працы» *(Мядзвядка)*, імя У. З. Царука *(Ярэмічы)*, імя Чапаева *(Горная Рута)*, імя Чарняхоўскага *(Турэц)*, імя Чырвоных партызан *(Пагарэлка)*, «Шлях Ільіча» *(Тупалы)*. Саўгасы і іх цэнтры: «Варонча» *(Варонча)*, «Карэлічы» *(Карэлічы)*, «Мірскі» *(Мір)*. Птушкафабрыка (Мір).

С. гасп. спецыялізуецца на мяса-малочнай жывёлагадоўлі, ільнаводстве; вырошчваюць цукр. буракі, бульбу і збожжавыя. Пад с.-г. ўгоддзямі каля 69% тэр. На пач. 1971 асушана 15,4 тыс. *га* забалочаных зямель. Агульная пасяўная пл. (тыс. *га*, 1970) 49,8, з іх пад збожжавымі і зернебабовымі 18,9, тэхн. 4,2, бульбай 8,1, кармавымі 19,2. На пач. 1971 было (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 54,0 (у т. л. кароў 24,4), свіней 37,5, авечак і коз 8,2. Аўтамаб. дарога Навагрудак — Карэлічы — Мір — Стоўбцы.

На пач. 1971 у раёне 14 сярэдніх, 22 васьмігадовыя, 42 пач. школы, 3 школы рабочай моладзі, 4 дашкольныя ўстановы, 33 масавыя б-кі, 44 клубныя ўстановы, 76 кінаўстановак (у т. л. 69 стацыянарных), 8 бальніц, 24 фельч.-ак. пункты. Працуе 475 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, у т. л. 9 інжынераў, 29 аграномаў, 53 заатэхнікі і вет. ўрачы, 15 эканамістаў, 43 урачы, 326 настаўнікаў; 525 чал. з сярэдняй спец. адукацыяй. Раённая газ. «Полымя». *С. І. Сідор.* Мінск.

КАРЭЛІЧЫ, гар. пасёлак (з 1958), цэнтр Карэліцкага р-на Гродзенскай вобл. Размешчаны на р. Рутка (бас. Нёмана), на шашы Навагрудак — Мінск; за 194 *км* на У ад



Карэлічы. Агульны від.

Гродна, 42 *км* ад чыг. ст. Гарадзея. 3,7 тыс. ж. (1971). Прамысл. прадпрыемствы: з-д масла і сухога малака, харчкамбінат, пякарня, камбінат быт. абслугоўвання, раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі, Мірскае спецыялізаванае аддз. Сельгастэхнікі. Сярэдняя школа, школа рабочай моладзі, муз. і дзіцячая спарт. школы, яслі-сад, Дом піянераў, Дом культуры, кінатэатр, 2 б-кі, бальніца.

К. вядомы з 14 ст., у 1505 спалены татарамі, у 1655 і 1706 — шведамі. У 19 ст. належалі кн. Вітгенштэйну. У бурж. Польшчы (1921—39) у Навагрудскім ваяводстве. У 1940—62 і з 1965 цэнтр раёна. З чэрв. 1941 да 2.7.1944 акупаваны ням.-фаш. захопнікамі. 2 помнікі: сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну, і работнікам міліцыі, якія загінулі пры выкананні службовых абавязкаў. Мемарыяльная дошка ў гонар Першай Баранавіцкай брыгады, якая разграміла ў К. ням. гарнізон 2.7.1944 і ўтрымлівала К. да прыходу Чырв. Арміі. Мемарыяльны комплекс сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну. *М. І. Собаль.* Гродна.

КАРЭЛЬСКАЯ АЎТАНОМНАЯ САВЕЦКАЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ РЭСПУБЛІКА (Карэлія), у складзе РСФСР. Утворана 25.7.1923. Размешчана на ПнЗ Еўрап. ч. СССР, на З мяжуе з Фінляндыяй. Пл. 172,4 тыс. $км^2$. Нас. 711 тыс. чал. (1971). Падзяляецца на 15 раёнаў; 12 гарадоў, 40 гар. пасёлкаў. Сталіца г. Петразаводск. Вышэйшыя органы дзярж. улады — Вярх. Савет Карэльскай АССР, які выбіраецца на 4 гады, а ў перыяд паміж сесіямі — Прэзідыум Вярх. Савета рэспублікі. Вышэйшы выканаўча-распарадчы орган — Савет Міністраў. Мясцовыя органы дзярж. улады — раённыя, гарадскія, пасялковыя і сельскія Саветы дэп. працоўных. Суд. сістэма: Вярх. суд Карэльскай АССР і раённыя нар. суды.

Прырода. К. займае ўсх. частку *Балтыйскага шчыта*. Паверхня — узгорыстая раўніна са слядамі дзейнасці ледавіка, шматлікія грады і ўзгоркі чаргуюцца з вузкімі западзінамі, занятымі вадой. На ПнЗ — узвышша Манселькя выш. да 578 *м*. З Пн на Пд цягнецца Заходне-Карэльскае ўзв. выш. да 417 *м*. На Пд Алонецкае ўзв. выш. да 313 *м*. Уздоўж Белага м., Анежскага і Ладажскага азёраў нізіны. Карысныя выкапні: граніт, дыябаз, мармур, даламіты, пегматыты, слюда, кварц, тытанамагнетытавыя і жал. руды, каляровыя металы, серны калчадан, сланцы і інш. Клімат умерана халодны, вільготны. Сярэдняя т-ра студз. ад —10 да —14, ліп. 14—16 °С. Ападкаў 400—600 *мм* за год. Вегет. перыяд каля 70 дзён на Пн і 125 на Пд. У К. больш за 50 тыс. азёраў, якія займаюць 15% плошчы. Найб. Ладажскае, Анежскае, Тапвозера, Сегозера, Пявозера, Выгозера. Рэкі, што злучаюць азёры, кароткія, парожыстыя, багатыя на гідраэнергію. Найб. вадаспад Ківач на р. Суне. Гал. рэкі: Кем, Выг, Водла, Шуя, Суна, усе лесасплаўныя. Па тэр. К. праходзіць *Беламорска-Балтыйскі канал*. Шмат балотаў. Глебы пераважна падзолістыя, падзоліста-глеевыя і тарфяна-балотныя. Пад лесам 53,4% тэр. Пераважаюць хвоя, елка, з лісцевых чачотка, якая ідзе на мэблю і маст. бытавыя вырабы, асіна, вольха. На азёрах, рэках і ўзбярэжжы Белага м. многа вадаплаўных птушак.

Насельніцтва. Асн. насельніцтва — карэлы, рускія, беларусы, вепсы, фіны. Сярэдняя шчыльн. 4,1 чал. на 1 $км^2$. Больш густа заселены паўд.-зах. і паўд. раёны. Гарадскога нас. 70%. Найб. гарады: Петразаводск (189 тыс. ж., 1971), Сортавала, Беламорск, Кондапага, Кем, Сегежа.

Гістарычная даведка. Тэр. К. заселена ў 7—6-м тысячагоддзях да н. э. Гал. занятак жыхароў — рыбалоўства і паляванне. Першыя звесткі пра плямёны карэлаў адносяцца да канца 1-га тысячагоддзя н. э. У 9 — пач. 12 ст. К. ўваходзіла ў склад Ст.-рускай дзяржавы, пасля яе распаду — у *Ноўгарадскую феадальную рэспубліку*. З 12 ст. ў К. вараджаюцца феад. адносіны; у 12—15 ст. складваецца карэльская народнасць. На яе фарміраванне ўплывала рус. культура. З 13 ст. тэр. К.— аб'ект агрэсіі шведаў, якія ў пач. 17 ст. захапілі Прыладажжа (вернута Расіі паводле Ніштацкага дагавору 1721). У *Паўночную вайну 1700—21* на тэр. К. пабудаваны Алонецкі і Пятроўскі металург. з-ды, якія забяспечвалі рус. армію і флот зброяй. У 1777 Пятроўская Слабада перайменавана ў Петразаводск. У 1769—71 адбылося буйное выступленне горназаводскіх сялян (Кіжскае паўстанне). З 2-й пал. 19 ст. сталі пераважаць капіталіст. адносіны, хоць у асноўным К. заставалася адсталай нац. ускраінай Расіі. Рэвалюц. ўплыў на мясцовых рабочых і сялян мелі ссыльныя бальшавікі (М. І. Калінін, К. С. Ерамееў і інш.). У рав. 1905—07 забастоўчы рух ахапіў многія прадпрыемствы. Вясной 1906 у Петразаводску ўзнікла першая с.-д. група (з 1907 к-т РСДРП), якая наладзіла сувязь з Пецярбургскай с.-д. арг-цыяй.

Сав. ўлада ўстаноўлена ў ліст. 1917 — сак. 1918. У 1918—20 і ў ліст. 1921 — лютым 1922 частка тэр. К. акупавана англа-франка-амерыканскімі інтэрвентамі. У баях супраць захопнікаў разам з Чырв. Арміяй удзельнічалі

Вадаспад Ківач на р. Суна.





Петразаводск. Праспект імя Леніна (злева). Кондапага на беразе Анежскага возера.

ўзбр. атрады працоўных К. 8.6.1920 створана Карэльская працоўная камуна; 25.7.1923 пераўтворана ў К. АССР у складзе РСФСР; у сак. 1940 — у Карэла-Фінскую ССР; 16.6.1956 пераўтворана ў К. АССР у складзе РСФСР. У Вял. Айч. вайну значная частка К. акупавана ням.-фаш. і фінскімі захопнікамі. Больш за 100 тыс. жыхароў К. змагалася ў Чырв. Арміі, партыз. атрадах, знішчальных батальёнах. Дзесяткі тысяч жыхароў К. ўзнаг. ордэнамі і медалямі, 26 прысвоена званне Героя Сав. Саюза. У 1965 К. АССР узнаг. ордэнам Леніна, у 1970 ордэнам Кастр. Рэвалюцыі.

Народная гаспадарка. Гал. галіны прамысловасці — лясная, дрэваапрацоўчая і цэлюлозна-папяровая. У 1970 вывезена драўніны 17,8 млн. $м^3$, у т. л. дзелавой 15,8 млн. $м^3$, выпрацавана піламатэрыялаў 3202 тыс. $м^3$, кардону 30,7 тыс. *т*, паперы 694,7 тыс. *т*, фанеры 30,7 тыс. $м^3$. Цэлюлозна-папяровыя прадпрыемствы ў Кондапазе, Сегежы, Піткяранце, Суаярві, Харлу, Ляскелі. Домабуд. камбінаты і камбінат буд. канструкцый у Петразаводску, Сегежы, Летнярэчанскім, мэблевы камбінат у Сортавале, мэблевыя ф-кі ў Петразаводску і Сортавале. Больш за 10 лесазаводаў. Найб. ГЭС Ондская, Маткожненская, Выгскія, Путкінская, Пальеазерская, Кондапажская. Выт. электраэнергіі 2508,6 млн. *кат·гадз* (1970). Машынабудаванне (Анежскі трактарны з-д, з-д цяжкага папераробнага машынабуд. ў Петразаводску, метызна-металургічны ў г. п. Вяртсіля; суднабудаванне, суднарамонт, станкабуд. ў Петразаводску). Здабыча і апрацоўка пегматытаў, кварцу, слюды, мармуру. Каляровая металургія (Надвоіцкі алюмініевы з-д). Пегматытавы з-д у Кондапазе, слюдзяная ф-ка ў Петразаводску. Прадпрыемствы буд. прамысловасці. Рыбакамбінаты ў Петразаводску, Беламорску, Сортавале; рыбазаводы. Мясакамбінат; малочны (Петразаводск), масларобны (Сортавала, Пудаж) з-ды. У Петразаводску швейна-трыкатажная і валюшна-лямцавая ф-кі, у Сортавале ф-ка сукна. Саматужныя промыслы (вырабы з чачоткі, вышыўкі). С. гасп. спецыялізуецца на мяса-малочнай жывёлагадоўлі. На 1.1.1971 у К. 56 саўгасаў і 12 калгасаў. Пад с.-г. ўгоддзямі (тыс. *га*, 1970) 234, з іх 70 ворных зямель, 115 сенажацяў, 43 пашы; 49,8 зямель асушана. Пасяўная пл. (тыс. *га*, 1970) 68, у т. л. пад кармавымі культурамі 57,2, бульбай 9,5, агародніна 0,9. На



Пд і ПдЗ сеюць збожжавыя. На пач. 1971 было (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 84,2 (у т. л. кароў 43,7), свіней 45,9, авечак і коз 68,7. Рыбалоўства, зверагадоўля. Даўж. чыгунак 1977 *км* (1970). Чыг. Ленінград — Мурманск, Петразаводск — Сортавала — Ленінград, Беламорск — Абазерскі, Суаярві — Юшкозера, Лоўхі — Сафпарог. Аўтамаб. дарог 8,3 тыс. *км*, у т. л. з цвёрдым пакрыццём 2,2 тыс. *км*. Суднаходства па Беламорска-Балт. каналу, Ладажскім, Анежскім азёрах, Белым моры.

Ахова здароўя. На тэр. сучаснай Карэліі ў 1913 было 13 бальнічных устаноў на 627 ложкаў (27,8 на 10 тыс. ж.), 72 фельчарскія, акушэрскія і інш. пункты, 71 урач (3,1 на 10 тыс. ж.), 147 чал. сярэдняга мед. персаналу (6,5 на 10 тыс. ж.). У 1940 — 3,4 тыс. бальнічных ложкаў, 260 фельч., акушэрскіх і інш. пунктаў, 457 урачоў (7,4 на 10 тыс. ж.), 2301 чал. сярэдняга мед. персаналу. На пач. 1971 працавалі 120 бальнічных устаноў на 10 065 ложкаў (149,7 на 10 тыс. ж.), 1968 урачоў (27,7 на 10 тыс. ж.), 7974 чал. сярэдняга мед. персаналу (112,1 на 10 тыс. ж.). Курорт Марцыяльныя Воды, 9 санаторыяў і дамоў адпачынку.

Культура. Да Кастр. рэв. калля 87% насельніцтва было непісьменнае, сярод карэльскага нас. значна больш. У 1914/15 навуч. г. працавалі 4 сярэднія школы; у агульнаадук. школах усіх тыпаў займалася 30 тыс. вучняў, у сярэдніх спец. навуч. установах 200 чал., ВНУ не было. За гады Сав. улады ажыццёўлена ўсеагульнае навучанне, падрыхтаваны нац. кадры. У 1970/71 навуч. г. працавалі 542 агульнаадук. школы усіх тыпаў (133 тыс. вучняў), 17 сярэдніх спец. навуч. устаноў (15,9 тыс. чал.), *Петразаводскі універсітэт*, Карэльскі пед. ін-т, філіял Ленінградскай кансерваторыі. Н.-д. работу вядуць 20 н.-д. устаноў: Карэльскі філіял АН СССР (засн. ў 1945) у складзе 4 ін-таў (геалогіі, лесу, біялогіі і ін-та мовы, л-ры і гісторыі), 2 аддзелаў (водных праблем і эканомікі), вылічальнага цэнтра; а таксама галіновыя н.-д. установы — Карэльскі НДІ лясной прамысл., н.-д. і праектна-канструктарскі ін-т цэлюлозна-папяровай прамысл., н.-д. і праектна-канструктарскі ін-т цэлюлознага машынабудавання і інш. У рэсп. (1970) 7 музеяў, 660 кінаўстановак, 530 масавых б-к, 515 клубных устаноў, тэлецэнтр, радыёстанцыя. У 1971 выпускалася 20 газет, 2 часопісы. Рэсп. газеты: «Ленинская правда», «Комсомолец», «Neuvosto Karjala» («Савецкая Карэлія», на фін. мове). У 1970 выдадзена 105 назваў кніг і брашур.

Л-ра К. ўзнікла пасля Кастр. рэвалюцыі. Да 1920 развівалася на рус. мове, а утварэннем Карэльскай працоўнай камуны 8.6.1920 і прыездам у К. фінаў-эмігрантаў — на фін. і рус. мовах. Вылучаецца творчасць Я. *Віртанена*, якога М. Горкі назваў «сапраўды рэвалюцыйным паэтам». 30-я г. — перыяд інтэнсіўнага развіцця ўсіх літ. жанраў. Асн. месца займаюць тэмы сацыяліст. буд-ва і рэвалюцыі. Дылогія Х. Тыхлі «Ліст пераварочваецца», раманы Т. Хеймаваара «З-пад бараны» і Э. Параса «Жыхары Юмаваары» пра шлях сялянства да рэ-

С. Х. Юнтунен. На рацэ Алонцы. 1963. Дзярж. музей выяўленчых мастацтваў Карэльскай АССР. Петразаводск.



валюцыі. Пераўтварэнне суровага краю ў гады першых пяцігодак — змест лірыкі І. Кутасава, Л. Хело (Т. *Гутары*), Ф. Ісакава. Драмы Р. Руско (Нюстрэм), раманы О. Іагансона, аповесці В. Чэхава заклалі аснову гістар. жанру ў л-ры рэспублікі. У Айч. вайну пісьменнікі прадаўжалі сваю дзейнасць у Сав. Арміі, у партызанах. На сучасным этапе шматгранна паказваюць жыццё пісьменнікі-карэлы А. Тыманен (раман «Роднымі сцежкамі»), П. Перту (аповесці «Залом», «Зарніцы»), Н. Лайне (Гіпіеў, аб. вершаў «Песні ліекси»), Я. Ругоеў (дылогія «Крыгаход»), Н. Якала (эпапея «Водападзел»), пісьменнікі-фіны: празаік У. Вікстрэм, паэт Т. Суманен; рус. пісьменнікі А. Ліпецкі, Д. Гусараў, П. Барыскоў, Ф. Трафімаў, Б. Шміт, М. Тарасаў і інш.

На тэр. К. зберагліся помнікі мастацтва неаліту і бронзавага веку (наскальныя выявы жывёл, чалавека, сцэны палявання і бітваў). Пасля ўваходу К. ў склад Ст. Русі маст. культура К. цесна звязана з рус. культурай. Зберагліся мноства выдатных драўляных пабудоў: Лазараўская ц. Мурамскага манастыра (канец 14 ст.), Успенская ў Кондапазе (1774), цэрквы сяла Вірма (1759), паселішча *Кіжы*; жылыя дамы, пабудаваныя «брусам» (дом-двор прамавугольны ў плане пад агульным дахам) і «кашалём» (дом-двор квадратны ў плане з дахам, які мае 2 схілы розных даўжынь). Пабудовы ўпрыгожаны багатай разьбою. Мураванае буд-ва пачалося ў 18 ст. ў Петразаводску, Алонцы, Кемі, Пудажы і інш. З 14 ст. вядомы іканапіс. Мясцовым абразам уласціва стрыманае пісьмо, нескладаная колеравая гама, амацыянальныя вобразы. У 16—19 ст. пад уплывам інш. іканапісных школ (растова-суздальскай, маскоўскай) складваецца некалькі кірункаў іканапісу ад манументальна-лапідарных да вытанчаных па малюнку. У сав. час забудоўваюцца і добраўпарадкоўваюцца старыя гарады, растуць новыя (Мядзведжагорск, Кондапага, Беламорск, Сенежа і інш.). У 1920—30 фарміруецца прафесійнае выяўл. мастацтва К. У жывапісе найб. пашыраны пейзаж, часта з жанравымі матывамі (В. Аўдышава, Б. Паморцаў, С. Юнтунен), партрэт (Г. Стронк, Ф. Ніемінен), нацюрморт (Л. Ланкінен). З 50-х г. развіваецца графіка, з 60-х — скульптура (Л. і Г. Ланкінены). У дэкар.-прыкладным мастацтве здаўна развіта выемчатая і ажурная разьба на дрэве, што ўпрыгожвае дамы, гасп. пабудовы, мэблю, посуд і інш. Пашырана вышыўка, якая мае ў розных раёнах свае асаблівасці.

Карэльскі муз. фальклор уключае карэльскія, фін., венскія, паморскія песні. Старадаўні фальклорны пласт — эпічныя песні руны, якія ўваходзяць у карэла-фін. эпас «*Калевала*». Былі папулярныя рунапеўцы А. і М. Пертунены, А. Малінен, В. Кіэлевяйнен. З нар. інструментаў: кантэле (шчыпковы), ёўхіка (смыковы). Прафес. муз. культура складваецца пасля Кастр. рэвалюцыі. Сярод карэльскіх кампазітараў: Л. Іоўсінен, Р. Пергамент (аўтар першай нац. оперы), К. Раўтыо, Г.-Р. Сінісала (аўтар першых карэльскіх сімфоній і балета). У Петразаводску працуюць муз.-драм. т-р (з 1955), сімф. аркестр (з 1933), ансамбль песні і танца Кар. АССР «Кантэле» (засн. ў 1936 кампазітарам і этнографам В. Гудковым), філіял Ленінградскай кансерваторыі (з 1967), муз. вучылішча (з 1938).

Да Кастр. рэвалюцыі не было прафес. т-ра. У 1918—22 у Петразаводску дзейнічаў рус. т-р (Нар. т-р драмы). Паявіліся самадзейныя рус., фінскія і карэльскія драм. гурткі, аматарскія калектывы («Карэльская сцэна» і інш.). З 1929 пралікуе т-р рус. драмы, у 1955 пераўтвораны ў муз.-драм. т-р. У 1932 створаны фінскі драм. т-р. (заснавальнік Р. Нюстрэм), які ставіць сусв., фінскую і рус. класіку, сучасную драматургію. Сярод тэатр. дзеячаў (1971): нар. арт. СССР Л. Томберг, нар. артысты РСФСР Д. Карпава, Т. Ромпайнен, Ю. Хумпі, засл. дзеячы маст. РСФСР В. Суні, С. Туарыла, нар. артысты Кар. АССР В. Тамашаўская, В. Фінагеева.

Літ.: Очерки истории Карелии. т. 1—2. Петрозаводск, 1957—64; Брюсов А. Я. История древней Карелии. М., 1940; Бубрих Д. В. Происхождение карельского народа. Петрозаводск, 1947; Машезерский В. И. Установление Советской власти в Карелии (1917—1918). Петрозаводск, 1957; Карельская АССР за 50 лет. Петрозаводск, 1967;

Экономические районы СССР, 2 изд., М., 1969; Очерк истории советской литературы Карелии, Петрозаводск, 1969; Летопись литературной жизни Карелии (1917—1961), Петрозаводск, 1963; Летопись литературной жизни Карелии (1962—1966), Петрозаводск, 1968; Писатели Карелии, Петрозаводск, 1970; Саватеев Ю. А. Рисунки на скалах, Петрозаводск, 1967; Ополовников А. В. Памятники деревянного зодчества Карело-Финской ССР, М., 1959; Плотников В. И. Изобразительное искусство Советской Карелии, Л., 1961; Рязузов С. Н. Музыкальная культура Карельской АССР, у кн.: Музыкальная культура автономных республик РСФСР, М., 1957; Лапчинский Г. И. Музыкальная культура Карелии, Л., 1968; Ярго Ж. Музыка Советской Карелии, Петрозаводск, 1970; История советского драм. театра, т. 2—5, М., 1966—1969. *Б. Б. Багаслоўскі* (прырода). Мінск; *В. І. Машэрскі, Я. А. Балагураў* (гістар. даведка), *М. Ф. Пахомава* (літаратура). Петразаводск.

КАРЭЛЬСКАЯ БЯРОЗА, асаблівая форма бародаўчатай бярозы з наплывамі, або *карасцямі*, у ніжняй частцы ствала. Гл. *Чачотка*.

КАРЭЛЬСКАЯ МОВА, адна з прыбалтыйскафінскай групы *фіна-угорскіх моў*. Блізкая да фінскай. Пашырана ў Карэльскай АССР і Фінляндыі. На К. м. гаворыць каля 120 тыс. чал. Пісьменнасці не мае, ужываецца ў вуснай форме. На тэр. Карэльскай АССР афіцыйныя мовы — руская і фінская.

У К. м. вылучаюць тры дыялекты: уласна карэльскі, лівікоўскі (ці аланецкі) і людзікоўскі. Асн. асаблівасці К. м.: у фанетыцы — гармонія галосных, у сінтаксісе — ужыванне паслялогаў. На К. м. зберагліся багатая вусная нар. творчасць (эпас «Калевала» і інш.).

Літ.: Языки народов СССР, т. 3, М., 1966.

КАРЭЛЬСКАЯ СКЛАДКАВАСЦЬ, сукупнасць тэктанічных рухаў і звязаных з імі працэсаў складкавасці, магматызму і рэгіянальнага метамарфізму ў раннім і сярэднім пратэразоі (1750±100 млн. гадоў назад).

Утварэнні К. с. (карэліды) развіты ў ядрах кансалідацыі больш старажытных складкавых збудаванняў складаюць крышталічны фундамент стараж. платформаў (Усх.-Еўрапейскай, Сібірскай і інш.). Тэктона-магматычнымі працэсамі больш позніх складкавасцей, пераважна гоцкай (верхні пратэразой), карэліды значна перапрацаваны. На Беларусі вобласць карэлідаў у крышт. фундаменце ўтварае характэрную мінералага-геахім. правінцыю з вянальным размеркаваннем жалеза, нікелю і інш.

Літ.: Хаин В. Е. Региональная геотектоника, М., 1971; Геология СССР, т. 3 — Белорусская ССР, М., 1971, с. 303—319.

КАРЭЛЯЦЫЯ ў матэматычнай статыстыцы (позналац. correlatio суадносіны), статыстычная ці імавернасная залежнасць паміж падзеямі, з'явамі, якая не мае строга функцыянальнага характару.

К. выражае сувязь паміж пераменнымі велічынямі, пры якой кожнаму значэнню адной пераменнай *X* не адпавядае пэўнае значэнне другой пераменнай *Y*. Гэта тлумачыцца тым, што на велічыню другой пераменнай уплывае не толькі першая пераменная, але і інш. фактары, ці абедзве залежаць ад некат. фактараў, сярод якіх ёсць агульныя для іх абедзвюх. Але сярэдняя значэнні *Y* вызначаюць некат. залежнасць ад *X*. Прыклады К.: залежнасць ураджайнасці аднолькавых участкаў глебы ад колькасці ўгнаенняў, залежнасць паміж вышынёй дрэва і яго дыяметрам. У матэм. статыстыцы распрацаваны розныя метады і спосабы даследавання К. Выкарыст. К. ў тэорыі сувязі, радыёлакацыі, біялогіі, медыцыне, эканоміцы.

Літ.: Айвазян С. А. Статистическое исследование зависимостей, М., 1968; Езекиэл М. и Фокс К. А. Методы анализа корреляций и регрессий линейных и криволинейных, пер. с англ., М., 1966.

М. Л. Пятровіч. Мінск.

КАРЭЛЯЦЫЯ (у біялогіі), узаемазалежнасць у зменлівасці паміж марфалагічнымі, фізіялагічнымі, біяхімічнымі прыкметамі раслінных ці жывёльных арганізмаў, узаемасувязь паміж біял. працэсамі з складаным перакрыжаваннем розных прычын, узаемных уплываў і іх вынікаў. Бывае дадатная (залежнасць паміж прыкметамі прамая) і адмоўная (залежнасць адваротная). Статыстычная мера ўзаемасувязі развіцця прыкмет — каэфіцыент К.

Літ.: Рокицкий П. Ф. Биологическая статистика, 2 изд., Мн., 1967.

КАРЭЛЯЦЫЯ СТРАТЫГРАФІЧНАЯ, супастаўленне пластоў горных парод аднаго адноснага геалагічнага ўзросту. Ажыццяўляецца паводле ўмоў залягання і літалагічных асаблівасцей горных парод (гл. рыс.), іх электрычных, акустычных, радыеактыўных і інш. уласцівасцей, знаходак астаткаў фаўны і флоры (гл. *Апорны гарызонт*).

За аснову звычайна бярэць стрататып — разроз, дзе ўпершыню былі вызначаны і апісаны адклады пэўнага геал. ўзросту. Супастаўленне рознафацыяльных разрэзаў (напр., марскіх і кантынентальных) праводзяць па астатках арганізмаў, спораў і пылку, пашыраных на плошчы незалежна ад літалагічнага характару адкладаў. К. с.— аснова пры геал. адымках, выкарыстоўваецца пры пошуках карысных выкапняў, асабліва нафты, каруч ых газаў, кам. вугалю, баксітаў і інш. Можа праводзіцца на асобных плошчах, радовішчах, ахопліваць значныя рэ-



Схема супастаўлення разрэзаў пярнуска-нароўскай серыі раёна г. Полацка: *1* — пясчанік; *2* — пясок; *3* — алеўраліт; *4* — алеўраліт гліністы; *5* — мергель даламітавы; *6* — мергель даламітавы пясчана-алеўрытавы; *7* — мергель даламітавы з гнёздамі сульфатаў; *8* — даламіт; *9* — даламіт з гнёздамі сульфатаў; *10* — даламіт аалітавы; *11* — брэкчыя даламітавая; *12* — сульфатныя пароды; *13* — свідравіна, якая ўскрыла адклады пярнуска-нароўскай серыі, і яе нумар.

гіёны і нават быць міжкантынентальнаю (планетарнаю).

Літ.: Степанов Д. Л. Принципы и методы биостратиграфических исследований, Л., 1958; Меннер В. В. Биостратиграфические основы сопоставления морских, лагунных и континентальных свит, М., 1962; Стратиграфическая классификация, терминология и номенклатура, Л., 1965.

А. В. Фурсенка. Новасібірск.

КАРЭНІШЧА, падземны парастак многіх шматгадовых травяністых раслін. Нагадвае корань, але адрозніваецца ад яго марфалагічна — мае родукаванае лісце накшталт дробных лусачак, на канцы верхавінкавую пупышку; каранёвага чэхліка і каранёвых валаскоў няма. Анат. будова адпавядае будове сцябла.

К. бывае тонкае і доўгае (асака раніял, пырнік), тоўстае і кароткае (півоня); хутка разгалінаваецца і займае вялікія плошчы (пырнік) або расце шчыльным кустом і ўтварае купіны (цімафееўка). К. размнажаецца большасць шматгадовых траў, агародніныя культуры (рэвень, спаржа), кветкавыя расліны (ландыш, касач, півоня). У К. некат. раслін назапашваюцца пажыўныя, лекавыя, дубільныя, фарбавальныя і інш. рэчывы.

Літ.: Курсанов Л. И. и др. Ботаника, т. 1 — Анатомия и морфология растений, 7 изд., М., 1966.

КАРЭНІШЧАВЫЯ РАСЛІНЫ, шматгадовыя травяністыя расліны, якія маюць *карэнішча*. Да К. р. належаць аквілегія, *армерыя, касач, ландыш, півоня, фіялка, флёкс, купена, шчаўе, вырнік, цімафееўка, метлюжок* і інш. Многія К. р. з-за таго, што ў іх штогод нарастае карэнішча, далёка адыходзяць ад месца, дзе выраслі ўпершыню. Уласцівасць пырніку хутка разрастацца робіць яго небяспечным пустазеллем, якое цяжка вынішчыць. Некат. расліны з доўгім карэнішчам (віды каласняку) добра замацоўваюць сыпкія пяскі.

Літ.: Флора БССР, т. 1—5, М.— Мн., 1949—59.

КАРЭСПАНДЭНТ (ад позналац. correspondeo адказваю, паведамляю), 1) літаратурны супрацоўнік газеты, часопіса, радыё, тэлебачання, агенцтваў друку і інфармацыйна-тэлеграфных агенцтваў.

К. падзяляюцца на ўласных (пастаянных), спецыяльных (раз'язных, выконваюць спец. даручэнні рэдакцыі), ваенных, замежных і інш. Акрамя штатных К. у СССР і інш. сацыяліст. краінах ёсць пазаштатныя: рабкор — рабочы К., селькор — сельскі К., юнкор — юны К., грамадскі К.— прадстаўнік грамадскасці, які выступае ў перыяд. друку, на радыё і тэлебачанні, калектыўны К.— арганізацыя (найчасцей рэдакцыя раённай, шматтыражнай газеты), што падтрымлівае сувязь з друкаваным органам.

2) Асоба ці ўстанова, што вядзе ад свайго імя або ад імя інш. асобы ці ўстановы перапіску з інш. асобай або ўстановай. 3) Член-карэспандэнт — чл. навук. т-ва ці навук. установы, які не мае ўсіх правоў правадз. члена (напр., член-кар. Акадэміі навук).

КАРЭСПАНДЭНЦЫЯ, гл. ў арт. *Жанры газетныя*.

КАРЭТКА (ад італьян. caretta цялежка), вузел механізма, машыны, які перамяшчаецца па накіравальніках ці, радзей, верціцца ў падшыпніках.

У металарэзных станках К.— частка супарта, у пішучых машынках — рамка з валікам для папяровы, у веласіпедах — педальны механізм, у ткацкіх станках — механізм для зеваўтварэння (гл. *Жакарда машына*) пры выпрацоўцы тканін дробна-узорыстых і складаных перапляценняў.

КАРЭЦ, 1) пасудзіна, вялікая конаўка з ручкай. 2) Адна з асноўных адзінак вымярэння сыпкіх рэчываў у сістэме мер Вял. кн. Літ., 102 літры (у бочцы 4 карцы). З 1766 стала наз. чвэрцю.

КАРЭЯ (кар. Часоп — літар. краіна раніцяй свежасці).

Змест:

Агульная частка
Карэя да 1948 478
Карэйская Народна-Дэмакратычная Рэспубліка (КНДР) 480
Паўднёвая Карэя 482

Краіна на У Азіі, на п-ве Карэя і прылеглых астравах. Пл. 220,8 тыс. км², насельніцтва больш за 45 млн. чал. (1970. Пасля вызвалення (15.8.1945) К. Савецкай Арміяй ад японскага калан. панавання на тэр. краіны часова створаны дзве ваен. адміністрацыі: на Пн — савецкая, на Пд — амерыканская. У Паўн. К. нар. масы ўзялі ўладу ў свае рукі, пачалі будаваць асновы незалежнай дэмакр. дзяржавы. У Паўд. К. амер. ўлады насуперак волі кар. народа інсцэніравалі сепаратныя выбары ў т. зв. Нацыянальны сход Паўд. К. і сфарміравалі 15.8.1948 рэакц. марыянетачны ўрад Карэйскай Рэспублікі. Прагрэс. сілы Пд і Пн, якія выступалі за стварэнне адзінай дэмакр. кар. дзяржавы, правялі на тэр. Паўн. і Паўд. К. агульнакарэйскія выбары ў Вярх. нар. сход К., першая сесія якога 9.9.1948 абвясціла стварэнне Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікі (КНДР). Іл. і карту гл. на ўкл.

Прырода. К. пераважна гарыстая краіна. На ПнУ найб. горныя хрыбты Мачхалён, Хамгён. Пучжалён з сярэдняй выш. больш за 2000 м (найб. выш. 2541 м, г. Кванмабон). Найвыш. пункт краіны гара Байтаўшань (Пэктусан, 2744 м) на граніцы з Кітаем. На ПнЗ ад хр. Пучжалён размешчана пласкагор'е Кэма. На ПнЗ К. горныя хрыбты Мёхян, Чаг'юрон і інш. Уздоўж усх. ўзбярэжжа грады Усх.-Карэйскіх гор. Найб. значны хр. Тхэбэн. Зах. і паўд. прыбярэжныя часткі К. пераважна раўнінныя. Карысныя выкапні: кам. і буры вугаль, жал. руда, вальфрамавыя, малібдэнавыя, свінцова-цынкавыя і медныя руды, руды паліметалаў, алюмініевая сыравіна, графіт, магнезіт, золата. Клімат мусонны, на б. ч. краіны ўмераны, на Пд субтрапічны. Лета гарачае, вільготнае. Сярэдняя т-ра студз. ад −21 на Пн да 4,3 °С на Пд; чэрв. ад 22 на Пн да 26 °С на Пд. Ападкаў 700—1500 мм за год, больш паловы выпадае ў чэрв.— жніўні. Рачная сетка густая. Рэкі пераважна горныя, невялікія, з летнім макс. расходам, суднаходныя ў нізоўях, багатыя на гідраэнергію, выкарыстоўваюцца на арашэнне. Найб. рэкі: Амнакан (кіт. Ялуцзян), Туманган (кіт. Тумыньцзян), Накданган, Ханган, Тэданган. Глебы б. ч. горна-лясныя бурыя; на Пн горнатаежныя падзолістыя; на Пд — чырваназемы і жаўтаземы. Пад лясамі 16 млн. га (70% тэр.), з іх 9 млн. га ў КНДР. Пераважаюць хваёва-шыракалістыя лясы, на Пд да выш. 300 м —

Узбярэжжа Японскага мора





Сплаў лесу па рацэ Амнакан.

субтрапічныя вечназялёныя лясы і хмызнякі з прымесямі трапічных формаў. Жывёльны свет: таежныя, субтрапічныя і трапічныя віды.

Насельніцтва. 99% — карэйцы, ёсць кітайцы. Дзярж. мова — карэйская. Сярэдняя шчыльн. нас. 204 чал. на 1 км². Густа заселены раўніны і марскія ўзбярэжжы, слабей горныя раёны Пн. Гарадскога нас. ў КНДР 45%, у Паўд. К. 30%. Вял. гарады і значныя прамысл. цэнтры: у КНДР Пхеньян (каля 1 млн. ж., з прыгарадамі, 1969), Чханчжын, Хамхын, Хынам; у Паўд. К. Сеул (5,5 млн. ж., 1970), Пусан, Тэгу.

Карэя да 1948. Гістарычны нарыс. Тэр. К. заселена чалавекам з часоў палеаліту. Стараж. гісторыя К. дэталёва не распрацавана. На думку некат. гісторыкаў, першым дзярж. аб'яднаннем у кар. плямёнаў была дзяржава Часон. У 108 да н. э. яе заваявала Ханьская дынастыя Кітая. Прыкладна ў 1 ст. н. э. ўзніклі тры раннефеад. дзяржавы: Кагуро, Пэкчэ і Сіла, якія вялі паміж сабою. У 7 ст. Сіла ў саюзе з кіт. дынастыяй Тан перамагла Пэкчэ і Кагуро, аб'яднала большую частку п-ва. Узнікненне адзінай дзяржавы спрыяла фарміраванню кар. народнасці. Узмацненне феад. эксплуатацыі выклікала ў 9 ст. ўзбр. сялянскія выступленні. Абвастрыліся феад. міжусобіцы. У 9 ст. Сіла распалася на асобныя феад. ўладанні, якія аб'ядналіся ў 10 ст. ў дзяржаву Каро, каб разам весці барацьбу з сялянскімі выступленнямі і абараняцца ад знешніх нападаў. З 1-й пал. 12 ст. слабее цэнтралізм, ўлада, вядуцца няспынныя войны паміж феадаламі. У 1231 у К. ўварваліся манголы, супраць якіх нар. масы змагаліся амаль 30 гадоў. У 1259 кар. ханы прызналі ўладу мангольскага хана. Толькі ў 1356 манголы выгнаны з К. (з в-ва Чэчжудо ў 1374). У 1392 да ўлады прыйшла дынастыя Лі. У перыяд яе праўлення раслі прыватныя землеўладанні, прыгонніцтва, узмацнілася феад. эксплуатацыя. У 16 ст. ўзнікла некалькі прыдворных «партый», якія імкнуліся да манапольнай улады. Саперніцтва ў феад. вярхах перашкаджала барацьбе супраць нашэсця яп. (канец 16 ст.) і маньчжурскіх (1-я пал. 17 ст.) заваёўнікаў. З 1637 К. ў васальнай залежнасці ад маньчжурскай дынастыі.

У 2-й пал. 17—18 ст. пашырылася прыватнае землеўладанне, узніклі рамесніцкія карпарацыі, выраслі буйныя гандл. цэнтры. На пач. 19 ст. ў К. наспеў глыбокі сац. крызіс. У 1811—12 у правінцыі Пхёнан успыхнула паўстанне сялян, у 1833 — гараджан Сеула, 21 сялянскае паўстанне адбылося ў 1862. З 2-й пал. 19 ст. К.— аб'ект калан. экспансіі капіталіст. краін. У 1876 Японія навязала ёй нераўнапраўны Канхваскі дагавор. У 1882 аналагічны дагавор К. падпісала з ЗША, у 1883 з Вялікабрытаніяй і Германіяй, у 1884 з Расіяй, пазней з Францыяй, Аўстра-Венгрыяй і інш. Умовы дагавораў спрыялі калан. рабаванню К., умяшанню замежных краін у яе ўнутр. справы. У 1893 у паўд. правінцыях К. успыхнула сялянскае паўстанне, якое перарасло ў вайну. Па просьбе кар. ўрада ў краіну ўведзены кіт. войскі. Гэта выкарыстала Японія, высадзіла на Карэйскі п-аў вял. армію і развязала яп.-кіт. вайну 1894—95, у якой перамагла. У рус.-яп. вайну 1904—05 Японія акупавала К., у ліст. 1905 навязала ёй дагавор аб пратэктараце, паводле якога фактычна вызначала знешнюю і ўнутр. палітыку К. Кар. народ выступіў супраць пагрозы страты незалежнасці і супраць эксплуатацыі замежнымі капіталістамі. Разгарнулася нац.-вызв. барацьба. Асаблівы размах яна набыла пасля ўстанаўлення яп. пратэктарату. На канец 1907 ва ўсіх паветах Паўд. і Цэнтр. К. дзейнічалі партыз. атрады. У 1910 яп. імперыялісты анексіравалі К. Каланізатары бязлітасна рабавалі кар. народ, заханілі лепшыя землі, асн. паэіцыі ў прамысловасці. Грабежніцкая палітыка выклікала глыбокае абурэнне кар. народа. Пад уплывам Вял. Кастр. сацыяліст. рэв. дзеянняў (1917) і Кастр. рэв. ў Расіі (1917) у К. ўзмацніліся рэв. настроі. Пад уплывам Вял. Кастр. сацыяліст. рэв. адбылося (1919) агульнанац. антыяпонскае паўстанне. З 1920 у прамысл. цэнтрах узнікаюць марксісцкія гурткі і групы. У 1925 засн. *Камуністычная партыя Карэі* (КПК), якая стала арганізатарам антыімперыял. выступленняў народа. У выніку бязлітасных рэпрэсій і актывізацыі дзейнасці французскіх рэпрэсій і актывізацыі дзейнасці французскіх КПК як арганізаваная сіла ў 1928 перастала існаваць, але камуністы не спынялі барацьбы, узначальвалі нац.-вызв. рух. Пад ім кіраўніцтвам на тэр. Маньчжурыі, дзе жыла значная колькасць карэйцаў, узніклі партыз. атрады, барацьбу якіх узначаліў *Кім Ір Сен*, Чхве Енгон і інш. Антыяпонскі рух асабліва ўзмацніўся ў 2-ю сусв. вайну.

У жн. 1945 Сав. Армія вызваліла К. На яе тэр. часова арганізаваны ваен. адміністрацыі: на Пн ад 38 паралелі — савецкая, на Пд — амерыканская (амер. войскі высадзіліся ў Паўд. К. ў верасні 1945, пасля капітуляцыі японскіх войск). У К. зноў засн. (1945) КПК (у 1946 яна аб'ядналася з Новай нар. партыяй на Пн у Працоўную партыю Паўн. К. і з Нар. і Новай нар. партыямі на Пд — у Працоўную партыю Паўд. К.). У краіне пачалася нар.-дэмакр. рэвалюцыя. За 1945—48 у паўн. частцы К. ажыццёўлены прагрэс. сацыяльна-эканам. пераўтварэнні: зямельная рэформа, нацыяналізацыя прамысловасці, транспарту, сувязі, банкаў, знешняга гандлю, 8-гадзінны прац. дзень, раўнапраўе жанчын, дэмакратызацыя асветы і інш. У Паўд. К. амер. ўлады ўсяляк падтрымлівалі барацьбу рэакц. сіл супраць нар.-дэмакр. рэвалюцыі. Насуперак рашэнню Маскоўскай парады 1945 міністраў замежных спраў СССР, ЗША і Вялікабрытаніі аб заснаванні на тэр. К. незалежнай дэмакр. дзяржавы амер. ўлады арганізавалі ў маі 1948 у Паўд. К. сепаратныя выбары і стварылі т. зв. Карэйскую Рэспубліку, у якой улада была аддадзена рэакц. праімперыял. элементам на чале з Лі Сын Манам. У гэтых умовах дэмакр. сілы ўзмацнілі барацьбу за стварэнне адзінай дэмакр. К. У жн. 1948 па ініцыятыве Працоўнай партыі Паўн. К. адбыліся ўсеаг. выбары (у Паўн. К. прамыя, у Паўд. нелегальныя, ускосныя) у Вярх. нар. сход, які 9.9.1948 абвясціў стварэнне Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікі (КНДР) і сфарміраваў урад на чале з Кім Ір Сенам. У 1949 Працоўная партыя Паўн. і Працоўная партыя Паўд. К. аб'ядналіся ў адзіную Працоўную партыю Карэі (ППК). Гісторыю К. пасля 1948 гл. ніжэй: Карэйская Народна-Дэмакратычная Рэспубліка і Паўднёвая Карэя (гістар. нарысы).

Горад Хамхын. Жылыя дамы рабочых.





Дэманстрацыя карэйскіх сялян з выпадку прыняцця закону аб аграрнай рэформе. 1946.

Літаратура. Кар. л-ра зарадзілася на пачатку н. э. Да канца 19 ст. двухмоўная: «прыгожая» на ханмуне (кар. стыль кіт. літ. мовы) і «простанародная» на кар. мове. Зберагліся 25 паэт. твораў на кар. мове — хянга (7—11 ст.). Узнікла паэзія на ханмуне (Чхве Чхі Вон). На ранняй прозе адбіўся ўплыў канфуцыянства («Гістарычныя запісы пра тры дзяржавы» Кім Бу Сіка) і будызму («Жыцце Кюнё» Хёк Нён Джона, «Забытыя падзеі трох дзяржаў» Ірона). У 11—14 ст. развіваўся новы від нац. паэзіі — каё. Паэзія на ханмуне дасягнула росквіту ў творчасці Лі Ін Но і Лі Гю Бо. Мастацкая проза адасобілася ад гістарычнай. Складаліся шматлікія зб. пхэсоль (проза малых формаў). Узоры на ханмуне сабраны ва «Усходняй анталогіі» (130 т., 1478). Важная вяха ў развіцці нац. л-ры — стварэнне кар. алфавіта (1444). Выдатныя майстры сярэдневяковых жанраў сіджо (трохрадкоўе) і каса (паэма) — Чон Чхоль, Пак Ін Но і Юн Сон До. Празаічныя творы на ханмуне — навелы Кім Сі Сыпа і алегорыі Ім Джэ. У 17—19 ст. на першы план выступае л-ра на кар. мове («Воблачны сон дзеяваці» Кім Ман Джуна, «Імджынская хроніка», «Аповесць пра Хон Гіль Дона» Хо Гюна, ананімная аповесць «Гісторыя пра вернасць Чхун Хян» і інш.). Пак Чы Вон і Чон Як Ён пашырылі ў л-ры ідэі сірхак («рэальныя навукі»). Шырокую вядомасць набылі вершы нар. паэта-вандроўніка Кім Саката. У канцы 19 ст. адбываецца пераход ад сярэдневяковай л-ры да новай (асветніцкія раманы Лі Ін Джыка). Пачынальнік сучаснай кар. прозы — Лі Гван Су, паэзіі — Чхве Нам Сон. Пад уплывам марксізма і Вял. Кастр. сацыяліст. рэв. ўзнікае прадвесніца пралет. л-ры — «школа новага кірунку» (Чхве Сахэ, Лі Сан Хва і інш.). Блізкія да іх — На До Хян і Кім Саволь. У 1925—35 актыўна дзейнічала Карэйская федэрацыя пралет. мастацтва, у якую ўваходзілі празаікі Лі Гі Ён, Чо Мён Хі, Сон Ён, паэты Пак Се Ён, Пак Пхар Ян і інш. Ва ўмовах яп. тэрору ліны вялі барацьбу за перадавую л-ру.

Архітэктура. Раннія помнікі архітэктуры К.— пахавальні 3—7 ст. правіцеляў дзяржавы Кагуро ў Анаку і каля Пхеньяна. У 6—14 ст. ствараюцца пячорны храм Сакурам (8 ст.), комплекс Пульгукса (8 ст.) каля Кёнчжу, вароты Тоданмун у Пхеньяне (10 ст.), пагада Ханмётхап храма Пансэка ў Сеуле (11 ст.), у 14 ст. будуецца манастыр Пусокса ў гарах Кымгансан (разбураны ў 1950—53). Іх архітэктура вызначаецца арыгінальнасцю драўляных і каменных канструкцый, багаццем дэкар. убрання. У 14—19 ст. палуляюцца палацавыя ансамблі (Кёнбакун у Сеуле, 14 ст., часткова разбураны ў 1950—53) з невял. пабудовамі, упрыгожанымі драўлянай і каменнай арнаментыкай; шырока выкарыстоўваўся маляўнічы рэльеф мясцовасці. Найб. значныя помнікі гэтага часу — мармуровая пагада храма Вангакса ў Сеуле (15 ст.), храмы Тандоса (16 ст., прав. Кёнсан-Намдо) і Чанапса (17 ст., у гарах Кымгансан). Нар. жыллё — нізкі аднапавярховы дом (з каменю, гліны, дрэва) з тэрасаю. У калан. перыяд (1910—45) стваралі-



Хан Ен Сік. Паэт-сатырык 19 ст. Кім Сакат. 1958.

ся будынкі, не ўласцівыя нац. характару архітэктуры.

Выяўленчае мастацтва. Да 4—6 ст. адносяцца роспісы ў пахавальнях правіцеляў дзяржавы Кагуро (партрэты, быт. сцэны); абярэгліся кераміка, вырабы з металу і лаку. У 7—10 ст. развіваецца скульптура з каменю (статуя Буды Майтрэі, 8 ст.) і бронзы (статуя бадхісатвы Каным, пач. 7 ст., абедзве з храма Сакурам), ювелірная справа, шаўкаткацтва, высокамаст. кераміка. Пашыраецца жывапіс тушшу на скрутках (10—14 ст.), маст. лакі, вытворчасць фарфору, удасканальваецца скульптура (статуя Буды Майтрэі, 10 ст., прав. Чхунчхон-Намдо). У 15—17 ст. вядомы жывапісцы Чон Сен (стваральнік нац. пейзажу), Кан Хі Ан, Юн Ду Со, Лі Ам. Дэмакр. кірунак у мастацтве К. ў 18 ст. прадстаўлялі жанрысты Кім Хон До, Кім Дык Сін. Найб. значныя майстры 19 ст.— Цян Сын Об, Нам Ге У. У канцы 19 ст. паявіўся алейны жывапіс. З пач. 20 ст. для развіцця культуры і мастацтва не было спрыяльных умоў. У гады яп. акупацыі, нягледзячы на тэрор, асобныя мастакі працавалі ў лепшых нац. традыцыях, вялі барацьбу з фармалістычнымі плынямі; скульптар Кім Бок Чжын (кіраўнік створанага ў 1925 Саюза карэйскіх пралетарскіх мастакоў) і інш. прагрэс. мастакі праўдзіва адлюстроўвалі барацьбу народа за незалежнасць. Цэнтрам маст. жыцця пасля вызвалення ад яп. прыгнёту стала Асацыяцыя працаўнікоў літаратуры і мастацтва Паўн. Карэі (1946).

Музыка. У аснове ладавай будовы кар. музыкі — пентатоніка з частым уключэннем паўтонавых інтэрвалаў. З муз. інструментаў вылучаецца каягым (шчыпковы). Станаўленне традыц. формаў кар. музыкі прыпадае на 3—9 ст. У канцы гэтага перыяду пры дварэ існавалі інстр.-харавыя ансамблі, наладжваліся паказы з музыкай. У 14—16 ст. у Сеуле створаны вял. хоры і аркестры. З 2-й пал. 16 ст. ў выніку вайны і яп. акупацыі муз. культура запецадае. У 2-й пал. 19 ст. ўзнік муз.-драм. жанр чангык, які ператварыўся ў адзін з відаў опер (яе стваральнік Сін Чжэ Хё). З пач. 20 ст. пранікае еўрап. музыка.

Тэатр, кіно. Тэатралізаваныя элементы былі ў стараж. харавых песнях-танцах. У сярэдніх вякі паявіліся танцы ў масках, з іх развіліся т-р масак (камён гык), нац. балет, ляллечны т-р (інхён гык) (камён гык), нац. балет, ляллечны т-р (інхён гык) і вял. камед. паказы (сандэ гык). У позняе сярэдневякоўе ўзнік размоўны т-р (хва гык). Вызв. рух вызначыў уздым нац. культуры ў 20-я г. 20 ст., створаны прафес. і аматарскія тэатр. калектывы. З сярэдзіны 30-х г. кар. т-ры закрываліся, акцёры выступалі толькі ў яп. рэпертуары. У 1921 пад кіраўніцтвам Юн Пэк Нама аматары вялі першы фільм. Вял. ўплыў на развіццё кіно аказала творчасць рэж. і акцёра На Ун Гю. З 30-х г. кіно К. было пад кантролем Японіі.

Літ.: Пак В. Д. Освободительная борьба корейского народа накануне первой мировой войны, М., 1967; Шабшина Ф. И. Очерки новейшей истории Кореи (1918—1945), М., 1959; История Кореи, т. 1, пер. с кор., М., 1960; Ванин Ю. В. Феодальная Корея в XIII—XIV вв., М., 1962; Тягай Г. Д.

Народное движение в Корее во второй половине XIX в., М., 1958; Шипаев В. И. Колониальное закабаление Кореи японским империализмом (1895—1917), М., 1964; Современная Корея, М., 1971; Никитина М. И. и Троцевич А. Ф. Очерки истории корейской литературы до XIV в., М., 1969; Елисеев Д. Корейская средневековая литература пхэсоль, М., 1968; Ли В. Н. Корейская ассоциация пролетарских писателей и проза 20—30-х г., у кн.: Национальные традиции и генезис социалистического реализма, М., 1965; Корейская живопись (Альбом), Пхеньян, 1957; Всеобщая история искусств, т. 2, кн. 2, М., 1961; Мартынов В. В. Корея, М., 1970.

В. А. Дзяменцьеў (прырода), *А. Я. Пейсаховіч* (гістар. нарыс). Мінск; *Л. Р. Канцэвіч* (літаратура). Масква.

Карэйская Народна-Дэмакратычная Рэспубліка (КНДР), дзяржава на Пн п-ва Карэя. Пл. 127,2 тыс. *км*², нас. каля 13,9 млн. чал. (1970). Сталіца Пхеньян. Краіна падзяляецца на 9 правінцый; 2 гарады — Пхеньян і Кэсон маюць статус правінцый.



Дзяржаўны лад. КНДР — сацыяліст. дзяржава. Дзейнічае канстытуцыя 1948. Вышэйшыя органы дзярж. улады — Вярх. нар. сход (ВНС), які выбіраецца на 4 гады, а ў перыяд паміж сесіямі — Прэзідыум ВНС. Выканаўчы орган дзярж. улады — Кабінет міністраў. Мясцовыя органы дзярж. улады — правінцыяльныя, гарадскія, павятовыя (раённыя) і сельскія нар. сходы. Суд. сістэма: Вярх. суд, правінцыяльныя суды, гарадскія (павятовыя) нар. суды, спец. суды.

Гістарычны нарыс. КНДР створана ў 1948 у выніку свабоднага волевыяўлення ўсяго кар. народа. Развіццё маладой краіны ўскладнялі вынікі шматгадовага калан. панавання яп. імперыялістаў, штучны падзел К., адсутнасць кваліфікаваных кадраў. У сак. 1949 падпісана сав.-кар. пагадненне пра эканам. і культ. супрацоўніцтва, якое мела вялікае значэнне для развіцця эканомікі і культуры КНДР. Сав. Саюз дапамог КНДР выканаць прыняты ў 1949 двухгадовы нар.-гасп. план. Засн. ў 1949 Адзіны дэмакр. айчынны фронт К, які аб'яднаў больш за 70 паліт. партый і грамадскіх арг-цый усёй К., няраз выступаў з ініцыятывай мірна аб'яднаць краіну. Аднак паўднёвакарэйскія ўлады адхілілі прапановы аб стварэнні адзінай К. У чэрв. 1950 пры падтрымцы ЗША яны справакавалі вайну супраць КНДР. З дапамогай сацыяліст. краін, прагрэс. грамадскасці свету народ КНДР абараніў свае рэвалюц. заваёвы. У чэрв. 1953 агрэсары мусілі падпісаць перамір'е. Вайна нанесла велізарныя страты эканоміцы КНДР. 3-гадовы план развіцця яе нар. гасп. (1954—56) прадугледжваў дасягнуць даваеннага ўзроўню прамысл. і с.-г. вытворчасці і рэканструяваць нар. гаспадарку. Пры садзеянні СССР, інш. сацыяліст. краін у КНДР за 3 гады адноўлена 240 і пабудавана 80 новых прадпрыемстваў, створаны новыя галіны прамысловасці — станка- і машынабудаванне. Ажыццяўлялася прынятая пленумам ЦК ППК у 1954 праграма кааперавання с. гасп. (закончана ў 1958). На 1958 рознымі формамі кааперацыі ахоплены дробныя і сярэднія прадпрыемцы, рамеснікі, гандляры. За гады 1-й пяцігодкі (1957—61) ва ўсіх сферах нар. гасп. перамаглі сацыяліст. вытв. адносіны. IV з'езд ППК (1961) прыняў 7-гадовы план развіцця нар. гасп. (1961—67). Выкананне яго з прычыны павелічэння выдаткаў на абарону (з-за пагрозы амер. імперыялізму) закончана ў 1970. За гэты перыяд нац. даход у параўнанні з 1946 павялічыўся больш як у 9 разоў. Працоўныя КНДР паспяхова выконваюць прыняты на V з'ездзе ППК (1970) 6-гадовы план развіцця нар. гасп. (1971—76), асн. задача якога закончыць стварэнне мат.-тэхн. базы сацыялізма. Вырашыць яе КНДР памагае СССР. Значны ўклад у развіццё эканам. і культ. сав.-кар. сувязей робіць БССР. Яна пастаўляе КНДР машыны, абсталяванне, рыхтуе спецыялістаў для яе нар. гаспадаркі.

Урад КНДР змагаецца за вывад амер. войск з Паўд. К. і за аб'яднанне краіны сіламі самога кар. народа, без умяшання замежных краін. На міжнар. арэне трымаецца міралюбнай палітыкі. У ліп. 1961 КНДР падпісала з СССР дагавор, накіраваны на ўмацаванне дружбы і супрацоўніцтва паміж абедзвюма краінамі, на стварэнне бяспекі на Д. Усходзе. Мае дыпламат. і консульскія адносіны з 41 краінай (на 1970; дыпламат. адносіны з СССР з 1948), падтрымлівае нац.-вызв. барацьбу народаў Індакітая супраць узбр. агрэсіі амер. імперыялістаў і іх сатэлітаў.

Палітычныя партыі, прафсаюзы і інш. грамадскія арганізацыі. Працоўная партыя Карэі. Засн. ў 1945, да 1946 — Камуністычная партыя Карэі. Больш за 1650 тыс. чл. і канд. Ген. сакратар ЦК *Кім Ір Сен*. Дэмакратычная партыя Паўн. Карэі. Засн. ў 1945. Партыя Чэндагё-Чэнудан. Засн. ў 1946. Адзіны дэмакратычны айчынны фронт Карэі. Агульнанац. фронт патрыят. партый і арг-цый Карэі, якія аб'ядналіся пад лозунгам барацьбы за адзінства краіны і за яе дэмакр. развіццё. Засн. ў 1949. Яднае 71 паліт. партыю і грамадскую арг-цыю ўсёй К. Аб'яднаныя прафсаюзы Карэі. Створаны ў 1945, больш за 2 млн. чл. Уваходзяць у *Сусветную федэрацыю прафсаюзаў*.

Народная гаспадарка. КНДР — індустр.-агр. краіна. У гады калан. залежнасці гаспадарка мела аднабокую структуру, была агр.-сыравінным прыдаткам Японіі. З 1946 праводзяцца важныя дэмакр. пераўтварэнні, якія залажылі аснову сацыяліст. перабудовы грамадства. Праведзена агр. рэформа, нацыяналізавана прамысловасць, транспарт, гандаль, сродкі сувязі, банкі. Дзярж. сектар стаў пануючым у нар. гаспадарцы. Эканам. развіццю значна пашкодзіла вайна 1950—53; войскі ЗША разбурылі больш за 8700 фабрычна-заводскіх будынкаў і вытв. збудаванняў, пашкодзілі каналы, дарогі, масты. Разбураная вайною гасп. адноўлена менш як за 3 гады і ў 1956 перавысіла ўзровень прамысл. і с.-г. вытворчасці 1949. Паспяховае выкананне наступных пяці- і сямігадовага планаў дало магчымасць поўнасцю перавесці эканоміку на сацыяліст. рэйкі.

Прамысловасць — галоўная галіна гаспадар-

Тэанскі электрамеханічны завод. Зборка генератараў.





1



2

Карэя I.

Карэйская Народна-Дэмакратычная Рэспубліка.

1. Паўночная частка Усходне-Карэйскіх гор — Кымгансан (Алмазныя горы).
2. Апрацоўка буйных дэталяў на Ронсанскім машынабудаўнічым заводзе.
3. Водазліўная плаціна Супхунскай ГЭС на рацэ Амнакан (Ялуцзян).
4. На двары Кіянскага трактарнага завода.
5. Планіроўка поля пад рыс у правінцыі Пхёнан-Намдо.
6. Пхеньян. Новая вуліца Чхаліма.



3



4



5




1


2


3


4


5

Карэя II.

1. Пагада Ханмётхап храма Папчэнса ў Сеуле. 1085.
2. Вароты Тэданмун у Пхеньяне. 982, перабудаваны ў 1635.
3. Помнік на магіле караля Кім Чун Чу ў Кёнчжу. 7 ст.
4. Кім Хон До. Танец. Жывапіс на паперы. 18 ст.
5. Хам Чон Ён. Літаграфія з серыі «Вострaў Качжэдо». 1957.
6. Ан Сан Мук. Мае аднавяскоўцы з Паўднёвай Карэі. Папера, каляровая туш. 1958.
7. Чо Гю Бон. Маці ў Паўднёвай Карэі. Таніраваны гіпс. 1959.
8. Плошча каля Дзяржаўнага мастацкага тэатра (1960) у Пхеньяне.


6


7


8



кі. Яна дае 80% (1969) валавой прадукцыі. Развіта цяжкая індустрыя: горназдабыўная, металург., хім., машынабудаўнічая. Аснова паліўна-энергетычнай гасп. — гідраэнергія і вугаль. У 1970 здабыта 27,5 млн. *т* каменнага (пераважна Пхеньянскі бас.) і бурага (у даліне р. Туманган) вугалю, выпрацавана 16,5 млрд. *кват·гадз* эл.-энергіі, 80% даюць ГЭС. Найб. з іх Супхунская на р. Амнакан. Развіта чорная і каляровая металургія на мясц. сыравіне і паліве. Асн. раён здабычы жал. руды (3,5 млн. *т*, 1968) — Мусан на Пн краіны. У 1970 атрымана 2,2 млн. *т* сталі і 1,4 млн. *т* пракату. Гал. цэнтры: Кім-Чак, Чханчжын, Пурон на ПнУ і Санім, Кансо на ПдЗ краіны. Каляровая металургія ў 1968 дала (тыс. *т*): цынку 80, свінцу 55, медзі 12. Машынабудаванне — адна з новых галін прамысловасці КНДР. Асвоена вытв. аўтамабіляў, горнаруднага абсталявання, станкоў, трактароў, с.-г. машын, электраабсталявання, марскіх суднаў, прылад. Хім. прамысл. спецыялізуецца пераважна на вытв. мінер. угнаенняў і сінт. валокнаў. Развіта вытв. буд. матэрыялаў, лясная і дрэваапрацоўчая, тэкст., харч. прамысловасць. У сельскай гаспадарцы занята палова насельніцтва, дае 1/3 нац. даходу, поўнасцю забяспечвае краіну харчаваннем і прамысл. сыравінай. Апрацоўваецца 1/6 плошчы краіны, 1/3 апрацаваных зямель арашаецца. Гал. галіна — земляробства збожжавага кірунку. Гал. збожжавыя культуры: рыс на паліўных землях (збор 4,8 млн. *т*, 1970), кукуруза (1600 тыс. *т*, 1967), ячмень, гаалян. Вырошчваюць соевы боб, бульбу, агародніну, з тэхн.— бавоўнік, тытунь, каноплі. Пашыраны садоўніцтва і шаўкаводства, вырошчванне жэньшэню. Жывёлагадоўля мае другараднае значэнне. Гадуюць буйн. раг. жывёлу (пераважна рабочую), свіней, авечак і коз. Рыбалоўства і марскі промысел. Даўж. чыг. 5 тыс. *км*, 1/4 электрыфікавана. На чыг. транспарт прыпадае 90% усіх грузаперавозак. Аўтамаб. дарог больш за 20 тыс. *км*. Важнае значэнне мае марскі транспарт. Гал. порты: Чханчжын, Хынам, Вансан, Намхо. КНДР гандлюе больш як з 70 краінамі свету. Вывозіць прадукцыю горназдаб., металург. і хім. прамысловасці, лесаматэрыялы, рыбу і рыбныя кансервы, садавіну, жэньшэнь; прывозіць машыны і абсталяванне, нафтапрадукты, бавоўну, воўну, прамысл. тавары. Асн. гандл. партнёры — сацыялісг. краіны, 1-е месца належыць СССР. Грашовая адзінка — вона КНДР.

Узброеныя сілы К. (Карэйская Народная Армія) складаюцца з сухапутных войск, ВПС і ВМФ.

Вярх. галоўнакамандуючы — прэм'ер-міністр. Кіруюць войскамі міністр абароны і Ген. штаб. Узбр. сілы КНДР створаны на базе партыз. атрадаў (першы з іх арганізаваны пад кіраўніцтвам Кім Ір Сена). У 1946 у Паўн. Карэі сталі ствараць першыя рэгулярныя вайсковыя часці. У час барацьбы супраць агрэсіі ЗША і лісіманаўскіх марыянетак у 1950—53 Карэйская Народная Армія ператварылася ў кадравую. Камплектуецца на падставе закону пра ўсеагульны вайсковы абавязак, тэрмін ваен. службы 2 гады.

Ахова здароўя. Сістэма аховы здароўя дзяржаўная, бясплатная. Створана хім.-фармацэўтычная і медыка-інструментальная прамысловасць. У 1964 было 545 бальніц на 51 078 ложкаў (5,1 на 1 тыс. ж.), 4776 паліклінічных устаноў, 22 706 урачоў і фельчараў (19 на 10 тыс. ж.). Рыхтуюць урачоў у 4 мед. ін-тах, сярэдніх мед. работнікаў у 7 мед. тэхнікумах. У 1962 нараджальнасць 41,1, агульная смяротнасць 10,8, натуральны прырост 20,3 на 1 тыс. ж. Ліквідаваны халера, воспа, брушны тыф.

Асвета, навуковыя ўстановы. У 1949 у краіне ў асн. ліквідавана непісьменнасць. У 1967 уведзена ўсеаг. абавязковае 9-гадовае тэхн. навучанне. Школа 9-гадовая, складаецца з пач. (4 гады) і сярэдняй 1-й ступені (5 гадоў), якая дае агульную сярэднюю і пачатковую тэхн. адукацыю. Скончыўшы 9-гадовую школу, дзеці паступаюць у 2-гадовую вышэйшую школу або ў вышэйшыя тэхн. школы, тэрмін навучання ў якіх 3—4 гады. Вышэйшыя тэхн. школы з'яўляюцца сярэднімі спец. навуч. ўстановамі. У 1967 было 9165 школ усіх тыпаў, у т. л. 3335 сярэдніх, 467 вышэйшых тэхн. школ. Да вызвалення К. (1945) ВНУ ў краіне не было. У 1949 працавала 15 ВНУ, у т. л. Пхеньянскі ун-т імя Кім Ір Сена (з 1948), політэхн., індустрыяльны, мед., пед. і інш. ін-ты. У 1970 у КНДР было 129 ВНУ. Студэнты тэхнікумаў і ВНУ атрымліваюць стыпендыю. Музеі: Карэйскай рэвалюцыі, гістар., этнаграфічны, айч. вызваленчай вайны, маст. галерэя (усе ў Пхеньяне) і інш. Найб. б-кі: Дзярж. цэнтральная, б-ка АН КНДР (цэнтр. навуковая) у Пхеньяне. Пасля вызвалення краіны інтэнсіўна развіваецца навука. Створаны навук. цэнтры — у Пхеньяне *Карэйская акадэмія навук* (з 1952) з філіялам у г. Хамхыне, акадэміі грамадскіх навук (з 1964), мед. навук (з 1958), лесатэхнічная, с.-г. навук.

Друк, радыё, тэлебачанне. У КНДР выдаецца каля 20 цэнтр. газет і часопісаў. Найб. уплывовыя газ.: «Надон сінмун» («Рабочая газета»), орган ЦК ППК; «Мінчжу Чосон» («Дэмакратычная Карэя»), орган Прэзідыума Вярх. нар. сходу і Кабінета міністраў КНДР; «Чагук тханіль» («Аб'яднанне радзімы»), орган К-та мірнага аб'яднання радзімы. Час.: «Кыначжа» («Працоўны»), тэарэт. і паліт. орган ЦК ППК; «Корейские профсоюзы» (на рус. і кіт. мовах), орган Аб'яднаных прафсаюзаў Карэі. Інфармацыю распаўсюджвае Цэнтр. тэлеграфнае агенцтва Карэі — ЦТАК. Карэйскі цэнтр. к-т радыёвяшчання.

Літаратура. Пасля 1945 у Паўн. К. развіваецца сацыяліст. л-ра (пазма «Пэктусан» Чо Гі Чхона і інш.). Многія творы прысвечаны кар.-сав. дружбе, буд-ву новай вёскі (раман «Зямля» Лі Гі Ёна), станаўленню рабочага класа (апавяданні і аповесці Лі Бук Мёна, Хван Гона, Юн Се Джуна). Вайна 1950—53 выклікала да жыцця патрыят. л-ру (Кім Са Ран, Пак Ун Голь, Хван Гон, Юн Се Джун, Чхон Се Бон, Чо Гі Чхон, Пак Пхар Ян, Мін Бён Гюн і інш.). У 1953 створаны Саюз пісьменнікаў К. Тэмы пасляваенных твораў — стваральная праца, поспехі сацыялізма, аб'яднанне краіны, антыімперыял. барацьба. На бел. мове асобнымі выданнямі выйшлі «Карэйскія казкі» (1954) і казка «Ластаўкі» (1957). На кар. мове надрукаваны зб. «У старых дубах» (1959) Я. Коласа, перакл. пасобныя творы В. Таўлая.

Архітэктура, выяўленчае мастацтва. Пасля вызвалення К. Сав. Арміяй пачалася рэканструкцыя гарадоў (ген. план Пхеньяна 1945—53), будуюцца жылыя дамы паводле тыпавых праектаў. У архітэктуры грамадскіх будынкаў нац. традыцыі спалучаюцца з сучаснымі формамі. Развіццю выяўл. мастацтва садзейнічала арганізацыя ў 1953 Саюза карэйскіх мастакоў. Сярод жывапісцаў Лі Чон, Лі Сок Хо, Кім Дэн Нам, Пхё Сэ Дзён, Хам Чон Ён, Ан Сан Мук і інш. Развіваецца скульптура (Мун Сок О, Хан Ён Сік), графіка (найб. ўвага аддавалася сатыры і плакату ў 1950—53), традыц. віды дэкар.-прыкладнога мастацтва.

Музыка, тэатр, кіно. Пасля 1945 у Паўн. К. развіваюцца ўсе галіны муз. мастацтва. Створаны муз. навуч. ўстановы (кансерваторыя ў Пхеньяне і інш.), муз. т-ры і калектывы, Саюз кампазітараў КНДР. Сярод кар. кампазітараў: Ан Гі Ок, Хван Хак Кын, Кім Вон Гюн. Пачаўся працэс адраджэння нац. тэатр. культуры. Арганізаваны трупы ў буйных гарадах, дзярж. т-ры ў Пхеньяне (1947). У 1950—53 працавалі франтавыя калектывы. Пасля вайны арганізаваны новыя трупы (у 1960 Вялікі т-р у Пхеньяне), лялечны і дзіцячы т-ры. Створаны ўмовы для развіцця нац. кіно. Працуюць: Кар. кінастудыя маст. фільмаў і Кар. кінастудыя дакумент. фільмаў (з 1958), студыя «8 лютага» і ін-т т-ра і кіно (з 1959).

Літ.: Ким Ир Сен. Избранные статьи и речи, пер. с кор., М., 1962; Современная Корея. Справочное издание, М., 1971; Корея: Север и Юг, М., 1965; Голосов С. М. По пути мира и социализма, М., 1965; Еременко Л. и Иванова В. Корейская литература, М., 1964; Всеобщая история искусств, т. 6, кн. 2, М., 1966; Латов В. Искусство в свободной Корее, М., 1955; Ким Джен Хи. Архитектура корейского народа, «Советская архитектура», 1952, № 2.

В. А. Дзяменцьеў (народная гаспадарка), *А. Л. Пейсаховіч* (гістар. нарыс), Мінск; *У. З. Клепікаў* (асвета), *Л. Р. Канцэвіч* (літаратура), Масква.

Паўднёвая Карэя, займае паўд. ч. п-ва Карэя і астравы. Пл. 99,6 тыс. км², нас. 31,5 млн. чал. (1970). Сталіца Сеул. Краіна падзяляецца на 9 правінцый, 2 гарады — Сеул і Пусан маюць статус правінцый.

Дзяржаўны лад. Т. зв. Карэйская Рэспубліка — незаконны антынародны рэжым, утвораны 5.5.1948 амер. акупацыйнымі войскамі. «Канстытуцыя» ўведзена ў дзеянне ў снеж. 1963. На чале рэжыму — прэзідэнт, які «выбіраецца» на 4 гады і мае самыя шырокія паўнамоцтвы. Паводле «канстытуцыі» заканадаўчая ўлада належыць аднапалатнаму нац. сходу, які выбіраецца на 4 гады. Прэзідэнт назначае і змяшчае прэм'ер-міністра і членаў урада.

Гістарычны нарыс. Пасля абвяшчэння (май 1948) т. зв. Карэйскай Рэспублікі ў Паўд. Карэі ўсталявалася ўлада буйной буржуазіі і памешчыкаў на чале з амер. стаўленікам Лі Сын Манам [1948—1960]. Яго ўрад падпісаў з ЗША пагадненні, якія забяспечылі паліт., эканам. і ваен. панаванне амер. імперыялістаў у Паўд. Карэі. Яна была выкарыстана ЗША як ваен.-стратэгічны плацдарм для ўзбр. агрэсіі 1950—53 супраць КНДР. Каланіяльная палітыка ЗША ў Паўд. Карэі — асн. прычына заста-



Расправа з дэманстрантамі, якія выйшлі на вуліцы Сеула, каб заявіць пратэст супраць рэжыму Пак Чжон Хі.



Паўднёвая Карэя. Жыллё беднякоў у Сеуле.

ялася эканамічная, абаронная і ідэалагічная залежнасць ад ЗША. Пасля ўзброенага выступлення студэнтаў (красавік 1960) Лі Сын Ман быў вымушаны падаць у адстаўку. Пасля кароткага перыяду ўлады ліберальна-буржуазнага ўрада Чан Мён (ліпень 1960 — май 1961) у краіне ўсталяваўся ваен.-фашысцкі рэжым Пак Чжон Хі. Ён праводзіць палітыку, скіраваную на ўзмацненне ваен.-паліцэйскага тэрору, ліквідацыю дэмакр. свабод, ажыццяўленне ваен.-эканам. саюза з ЗША і Японіяй, ператварэнне краіны ў плацдарм для ваен. авантур імперыялістаў. Ваен. дыктатура ўзмацніла эканам. і паліт. залежнасць ад ЗША і Японіі, ператварыла краіну ў рынак збыту таварных рэсурсаў гэтых краін, у сферу прымянення іх капіталаў. Пад кантролем амер. манапалістаў знаходзяцца ўсе галіны эканомікі краіны. Амер. манаполіі атрымалі права ствараць на тэр. Паўд. Карэі прадпрыемствы без удзелу нац. капіталу. Рост мілітарызацыі абцяжарыў нар. масы. Растуць падаткі (у параўн. з 1965 у 1970 выраслі ў 5 разоў), цэны на прадметы першай неабходнасці. У знешняй палітыцы ўрад Паўд. К. трымаецца курсу ЗША. На яе тэр. размешчаны дзесяткі амер. ваен. баз, 53 тыс. амер. салдатаў. З дапамогай ЗША мадэрнізуецца 700-тысячная паўд.-кар. армія. У Паўд. В'етнаме. Не спыняюцца ваен. правакацыі супраць КНДР. Паўд.-кар. рэвалюцыянеры, шырокія колы насельніцтва змагаюцца супраць рэакц. марыянетачнага рэжыму, супраць амер. акупантаў і ўмацавання паэіцыі яп. мілітарызму, за мірнае, дэмакр. аб'яднанне краіны.

Гаспадарка. Паўд. Карэя — агр. краіна. Эканоміка поўнасцю залежыць ад замежнага капіталу, пераважна ад ЗША, Японіі, ФРГ, Францыі. У 1969 эканам. «дапамога» ЗША склала каля 100 млн. дол. Манаполіі ЗША ператварылі Паўд. К. ў рынак збыту сваіх тавараў, зрабілі яе пастаўшчыком стратэгічнай сыравіны і таннай рабочай сілы, вытворцам ваен. тавараў для амер. арміі, размешчанай у Паўд.-Усх. Азіі. У выніку разрыву эканам. сувязей з індустр. Поўначчу эканоміка Паўд. К. мае аднабокі характар. Прамысл. прадпрыемствы адчуваюць недахоп сыравіны, паліва, эл.-энергіі. Дробныя і сярэднія прадпрыемцы разараюцца, расце беспрацоўе. Сярод галін прамысловасці вылучаецца горназдабыўная. Асн. мінер. багацце Паўд. К. — вальфрам. Здабываюць вугаль, жал. руду, графіт, золата, руды радыеактыўных элементаў. Прамысловасць тэкст. (пераважна баваўняная) і харч. (пераважна тытунёвая і вінаробная). Асн. цэнтры: Сеул, Тэгу, Пусан, Кванчжу, Масан. У Пусане радыёэлектронны з-д, які выконвае пераважна ваен. заказы. Працуюць 2 з-ды (у Самчхоку і Інчхоне) па выпуску азотных угнаенняў, аўтамаб. шын, гумавага абутку. У с. гасп. занята 60% самадзейнага нас. краіны, дае каля 80% валавой прадукцыі. Не забяспечвае патрэб краіны ў харч. прадуктах. У с. гасп. пануюць феад.-капіталіст. адносіны і буйное памешчыцкае землеўладанне. Амаль палова сялянскіх гасп. мае ўчасткі менш за 0,4 *га*, астатнія беззямельныя і батракі. Асн. галіна с. гасп. — земляробства. Апрацоўваецца каля 2,3 млн. *га* зямлі. Гал. збожжавая культура — рыс, у севазвароце з ім сеюць ячмень; вырошчваюць пшаніцу, чумізу, кукурузу. З тэхн. сеюць бавоўнік, тытунь, каноплі. Шаўкаводства, вінаградарства, агародніцтва, рыбны промысел. Даўж. чыг. 2,9 тыс. *км* (1964). Аўтамаб. дарог каля 31 тыс. *км*. Важную ролю ў перавозках адыгрывае марскі транспарт. Гал. порты: Пусан, Інчхон, Кунсан, Макпхо. У 1969 экспарт склаў 702,8 млн. дол. (каля 50% у ЗША, каля 25% у Японію); імпарт 1953 млн. дол. Паўд. К. вывозіць вальфрам, графіт, прадукты марскога промыслу і с. гасп.; прывозіць прадукты харчавання, бавоўну, штучныя ўгнаенні, нафту, вугаль, машыны. Асн. гандл. партнёры: ЗША і Японія. Грашовая адзінка — вона Паўд. Карэі.

Узброеныя сілы складаюцца з сухапутных войск, ВПС і ВМС. Агульная колькасць (1970) больш за 620 тыс. чал. Вярх. галоўнакамандуючы — кіраўнік марыянетачнага ўрада. Агульнае кіраванне арміяй ажыццяўляе міністр абароны праз аб'яднаны камітэт нач. штабоў і камандуючых відаў узбр. сіл. Сухапутныя войскі (каля 550 тыс. чал.) складаюцца з 2 армейскіх і 5 корпусных упраўленняў; усяго 19 пяхотных, 10 рэзервовых дывізій, 2 танкавыя брыгады, 2 пях. дывізіі і больш за 10 спец. часцей. Узбраенне пераважна амер. вытворчасці. ВПС (каля 23 тыс. чал.) маюць 1 аператыўнае камандаванне, 1 брыгаду ППА і інш. падраздзяленні; на ўзбраенні 215 баявых і 160 дапаможных самалётаў амер. вытворчасці. Ёсць некалькі дывізіёнаў зенітных кіроўных ракет. У складзе ВМС (каля 48 тыс. чал., уключаючы 30 тыс. чал. марской пяхоты) 1 баявая эскадра, 3 дывізіёны вартавых караблёў, некалькі дывізіёнаў тральшчыкаў, дэсантных і дапаможных суднаў.

Ахова здароўя. Адзінай сістэмы аховы здароўя няма. Пераважае прыватнакапіталістычная. Мед. дапамога платная. На пач. 1969 было 16 клінік, 207 бальніц, 5059 амбулаторый, 1141 стаматалагічная клініка, 12 569 урачоў (1 на 2465 ж.), 1929 стаматолагаў, 12 633 фармацэўты, 5996 акушэрак. 33% урачоў і 37% зубных урачоў працуюць у Сеуле. Праблема аховы здароўя — нястача ўрачоў і дарагавізна мед. дапамогі (у 1966 дзень стацыянарнага лячэння каштаваў 300—1000 вонаў). Рыхтуюць урачоў у мед. коледжах. У 1964 нараджальнасць 39,6, смяротнасць 7,5, натуральны прырост 32,1 на 1 тыс. ж. Пашыраны туберкулёз, праказа, брушны тыф, паратыфы і малярыя.

Асвета, навуковыя ўстановы. Фармальна пач. навучанне абавязковае, але не ажыццяўляецца

з-за недахопу школ, настаўнікаў, цяжкага матэрыяльнага становішча бацькоў. Навучанне і выхаванне ў школах праслякнута ідэалогіяй антыкамунізму, праслаўляецца «амерыканскі лад жыцця». Пач. школа 6-гадовая. Сярэдняя школа 6-гадовая, мае 2 ступені па 3 гады кожная. Навучанне платнае і раздзельнае. 2-я ступень сярэдняй школы маладаступная дзецям працоўных. У 1969/70 навуч. г. ў пач. школах займалася 5,8 млн., у сярэдніх 1,4 млн. вучняў. Прафес. падрыхтоўка — на базе 1-й ступені сярэдняй школы або на базе пач. школы. Вышэйшую адукацыю даюць ун-т у Сеуле, ін-ты і коледжы. У Сеуле Нац. цэнтр. б-ка, б-ка ун-та, Нац. музей, акадэмія навук, акадэмія мастацтваў. НДІ: атамнай энергіі, Метэаралагічная служба, Геал. служба, Ін-т індустр. даследаванняў, Інстытут навуковых даследаванняў Міністэрства абароны.

Друк, радыё, тэлебачанне. У Паўд. К. выдаецца больш за 10 газет і часопісаў. Найб. масавымі тыражамі выходзяць штодзённыя газ.: «Кёнхян сінмун»; «Korean Herald» («Карэйскі веснік»), на англ. мове; «Сеул сінмун» («Сеульская газета»); «Тон'а ільбо» («Усходнеазіяцкая газета»); «Хангук ільбо» («Карэйская газета»); «Часон ільбо» («Карэйская газета»). Працуюць інфармацыйнае агенцтва Хабтон Тхансін і ўрадавая служба радыёвяшчання і тэлебачання.

Культурнае жыццё. У л-ры Паўд. К. моцныя антыкамуніст. тэндэнцыі, апалагетыка паўд.-кар. марыянетачных рэжымаў, містыцызм, пошукі спецыфікі «ўсходняга стылю». Але ўсё болей пісьменнікаў становіцца на шлях рэаліст. паказу жыцця. У мастацтве афіцыйна прызнаны фармалістычныя кірункі. Творы невял. групы мастакоў, якія працуюць у стылі нац. жывапісу, праслякнуты песіміст., упадніцкімі настроямі. Муз. культура развіваецца ў цяжкіх умовах засілля камерцыйнай прадукцыі ЗША. Прагрэс. музыканты праследуюцца. У Сеуле працуюць невял. оперная трупа, сімф. аркестр і муз. школа. У 1945 у Паўд. К. ўзніклі прагрэс. тэатр. калектывы, у 1946 закрыты. Большасць тэатр. дзеячаў перайшла ў т-ры Паўн. К.

Літ.: Мазуров В. М. США и Южная Корея, М., 1971.

В. А. Дзяменцьеў (гаспадарка), *А. Я. Пейсаховіч* (гістар. нарыс). Мінск; *У. З. Клепікаў* (асвета, навук. ўстановы). Масква.

КАСА (італьян. cassa ад лац. capsa скрыпка), 1) памяшканне для прыёму, хавання і выдачы грошай і інш. каштоўнасцей. 2) Грашовая наяўнасць. 3) Бухгалтарскі рахунак, на якім улічваюць наяўнасць і перамяшчэнне грашовых сродкаў. 4) Назва некат. крэдытных устаноў *(ашчадныя касы)* і арг-цый *(касы ўзаемадапамогі)*.

КАСА́ (у геаграфіі), вузкая намыўная палоса сушы (з пяску, галькі, ракушачніку) у моры, возеры, рацэ, злучаная адным канцом з берагам. Памеры К. мяняюцца: найб. вышыня да некалькіх метраў, шырыня да некалькіх кіламетраў, даўжыня — дзесяткі і сотні кіламетраў (Арабацкая Стрэлка ў Азоўскім м.— 220 *км*).

КАСА ЎЗАЕМАДАПАМОГІ, добраахвотнае аб'яднанне членаў прафсаюза прадпрыемства, установы, арганізацыі для таварыскай узаемнай матэрыяльнай дапамогі. Выдае пазыкі і грашовыя дапамогі.

Ствараецца рашэннем мясцовага камітэта прафсаюза і працуе пад яго кіраўніцтвам. Члены К. ў. плацяць уступны ўзнос і штомесячныя членскія ўзносы, якія вяртаюцца пры выбыцці з касы. Сродкі К. ў. складаюцца з гэтых узносаў, працэнтаў за карыстанне пазыкамі, датацый прафсаюзных арг-цый, працэнтаў па бягучых рахунках і інш. Органы К. ў.— агульны сход членаў і выбраныя імі праўленне і рэвіз. камісія. Дзейнічае на падставе статута, карыстаецца правамі юрыд. асобы.

КАСАБЛА́НКА (Casablanca), Дар-Эль-Бейда, горад на З Марока, на Атлант. узбярэжжы. Адм. ц. аднайменнай правінцыі. Засн. ў 15 ст. як партугальская гандл. і ваен. факторыя. Чыгункаю злучаны з Алжырам і гарадамі краіны. Вузел аўтамаб. дарог. Аэрапорт (міжнар.). Порт ($^3/_4$ грузааабароту портаў краіны). 1,3 млн. ж. (1969). Філіялы і агенцтвы вял. замежных кампаній і банкаў. Суднабуд. верфі, металург. і хім. з-ды, тэкст., абутковыя і швейныя майстэрні, вытв. цэменту, суперфасфату, паперы, мыла, цукру, кансерваў, аліўкавага алею, палігр. камбінат, аўтамабільны завод.

КАСАБУЦКІ Іван Сцяпанавіч [н. 7(19).3.1895, г. Сянно Магілёўскай губ.], генерал-лейтэнант (1944). З сялян. Чл. КПСС з 1926. Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1930), Ваен. акадэмію Ген. штаба (1940). У арміі з 1915, у Чырв. Арміі з чэрв. 1918. Удзельнік грамадз. вайны на Віленскім, Маладзечанскім, Мінскім, Дзвінскім, Барысаўскім, Баранавіцкім, Ваўкавыскім, Брэст-Літоўскім, Слуцкім напрамках і ў раёне Мазыра супраць польскіх інтэрвентаў, бандаў Булак-Балаховіча — камандзір палка, брыгады. У 1921—38 камандзір брыгады, корпуса, нам. нач. штаба ваен. акругі. У Айч. вайну на Паўн.-Зах., Паўд.-Зах. і 3-м Укр. франтах: камандзір корпуса, пам. камандуючага войск фронту. Удзельнік вызвалення Днепрапятроўска, Крывога Рога, фарсіравання Буга, Днястра і Яска-Кішынёўскай аперацыі. З 1946 ст. выкладчык і нам. нач. кафедры Ваен. акадэміі Ген. штаба. З 1953 у запасе. Узнаг. ордэнам Леніна, 6 інш. ордэнамі, медалямі, ордэнам НРБ. Жыве ў Маскве.



КАСАВІЧОЎ Якаў Фёдаравіч [н. 3(16).3.1908, в. Арлоўка Баброўскага пав. Варонежскай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1932. У Чырв. Арміі з 1930. На фронце з 1943. Вызначыўся ў чэрв. 1944 пры вызваленні Магілёва. Полк пад камандаваннем К. першы ў дывізіі фарсіраваў Дняпро на Пд ад Магілёва, знішчыў 700 і ўзяў у палон 200 гітлераўцаў. Жыве ў Маскве.

КАСАВОКАСЦЬ, стан вачэй, пры якім зрокавыя лініі не сыходзяцца на аб'екце фіксацыі: зрокавая лінія аднаго вока адхіляецца ў бок носа (сыходная К.) або да скроні (разыходная К.), радзей уверх ці ўніз. Адрозніваюць садружную і паралітычную К.

Садружная К. бывае ад паніжання зроку аднаго вока, анамалій рэфракцыі, ад парушэння акамадацыі і канвергенцыі, функцыян. слабасці мышцаў вока. Захоўваецца поўны аб'ём рухаў вочнага яблыка, вугал К. пастаянны. Паралітычная К. бывае ад паралічу або парэзу вочных мышцаў пры інфекц. хваробах і хваробах нервовай сістэмы з абмежаваннем рухаў, дваеннем адлюстравання (дыпланіяй), зменай вугла К. Лячэнне: пры са-

дружнай К.— акуляры, спец. практыкаванні, хірург. аперацыя; пры паралітычнай — ліквідацыя асн. хваробы, аперацыя.

Літ.: Архангельский В. Н. Глазные болезни, 2 изд., М., 1969; Золотарева М. М. Глазные болезни, 2 изд., Мн., 1964.

М. М. Залатарова. Мінск.

КАСАВЫ ПЛАН Дзяржбанка СССР, дзярж. план, які вызначае аб'ём і крыніцы паступлення наяўных грошай, памеры і мэтавы кірунак іх выдаткавання, а таксама памеры выпуску грошай у абарачэнне або іх зняцця; састаўная частка плана развіцця народнай гаспадаркі. Адлюстроўвае перамяшчэнне ўсіх наяўных грошай праз касы Дзяржбанка СССР, садзейнічае кантролю за абарачэннем тавараў, за фін. дзейнасцю прадпрыемстваў, што робяць паслугі насельніцтву, за правільным выкарыстаннем фондаў заработнай платы і інш. З дапамогай К. п. ажыццяўляецца аперат. і канкр. планаванне грош. абарачэння ў краіне. К. п.— адзін з вырашальных фактараў забесп. ўстойлівасці сав. валюты.

Уведзены К. п. у СССР у 1930. Складаецца ў цэлым па краіне, саюзных рэспубліках, краях, абласцях і р-нах на аснове паказчыкаў нар.-гасп. плана, *бюджэту дзяржаўнага* і *балансу грашовых даходаў і расходаў насельніцтва*. Існуюць гадавыя, квартальныя і месячныя. У прыходнай частцы плана паказваюцца грашовыя паступленні, у расходнай частцы плануюцца выдаткі. Перавышэнне расходнай часткі над прыходнай балансуецца павелічэннем, а адваротныя суадносіны прыходу і выдаткаў — скарачэннем памераў грашовай масы ў абарачэнні. У першым выпадку грашовыя знакі з рэзервовых фондаў перадаюцца ў абаротныя касы, у другім — знімаюцца з абарачэння і перадаюцца з абаротных кас у рэзервовыя фонды. Усе грошы, што паступаюць у дзярж., каап. і грамадскія прадпрыемствы, арг-цыі і ўстановы, абавязкова здаюцца ў касы Дзяржбанка, усе выдаткі наяўнымі грашыма ажыццяўляюцца за кошт сум, атрыманых у банку (усе выключэнні абумоўлены законам).

Літ.: Денежное обращение и кредит СССР, М., 1970; Атлас З. В. Социалистическая денежная система, М., 1969.

З. І. Гіяргідзе. Мінск.

КАСА́ЕЎ Асман Мусаевіч (1916, аул Хурзук Батлапашынскага аддзела Кубанскай вобл.— 13.2.1944), удзельнік партыз. руху ў Магілёўскай вобл. ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1965). З сялян. Чл. КПСС з 1941. Скончыў кав. і артыл. вучылішчы (1938, 1939). У Чырв. Арміі з 1937. Удзельнік вызвалення Зах. Беларусі (1939). У Айч. вайну на Зах. фронце. У партызанах з 1941 — камісар групы, атрада, камандзір атрада; з 15.11.1943 камандзір *партызанскага палка 121-га*, які пасля смерці К. названы яго імем. Загінуў ад варожай бомбы. Пахаваны ў Магілёве. У в. Вугальшчына пастаўлены помнік, імем К. названа в. Сярмяжанка, школа ў в. Заполле (Бялыніцкі р-н), вуліца ў Магілёве.



Літ.: Дорога в бессмертие, Мн., 1967, с. 130—149; В памяти народной, Мн., 1969, с. 289—290; Люди легенд, в. 4, М., 1971, с. 146—157.

КАСАКО́ЎКА, вёска ў Папаратнянскім с/с Жлобінскага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр калгаса «Шлях Леніна». За 25 *км* на Пд ад Жлобіна, 108 *км* ад Гомеля, 20 *км* ад чыг. ст. Мормаль. 506 ж., двароў 170 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, дзіцячы сад, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, швейная майстэрня, магазін.

КАСАЛА́ПАСЦЬ, складанае скрыўленне ступні з паваротам яе ўнутр (унутраная К.) або вонкі (вонкавая К.).

Бывае прыроджаная (двухбаковая, звычайна ўнутраная) і набытая (траўматычнага і паралітычнага паходжання, звычайна вонкавая). Лячэнне кансерватыўнае — выпраўленне дэфармацыі ступні павязкамі і хірург. аперацыямі.

Літ.: Чаклин В. Д. Основы оперативной ортопедии и травматологии, М., 1964.

КАСА́ЛЬС, Казальс (Casals) Пабла (н. 29.12.1876, г. Вендрэль), іспанскі віяланчэліст. Зрабіў уплыў на развіццё сусв. віяланчэльнага мастацтва. Канцэртаваў у многіх краінах, у т. л. ў Расіі. Кіраваў арганізаванымі ім сімф. аркестрам (1919—36) і Рабочым канцэртным т-вам (1924—36) у Барселоне. Антыфашыст, у 1939 пакінуў Іспанію і жыве ў Прадзе (Францыя), дзе з 1950 штогод праводзяцца муз. фестывалі яго імя. У знак пратэсту супраць падтрымкі зах. дзяржавамі рэжыму Франка адмовіўся ад канцэртнай дзейнасці.

Літ.: Гинзбург Л., П. Казальс, 2 изд., М., 1966; Корредор Х. М. Беседы с Пабло Казальсом, пер. с франц., Л., 1960.

КАСАЛЯ́НКА, рака, правы прыток Сажа (бас. Дняпра). У верхнім цячэнні наз. Перагонка. Даўж. 34 *км*. Цячэ ў Слаўгарадскім р-не Магілёўскай і Кармянскім р-не Гомельскай абл. Вадазбор (352 км²) у межах Цэнтральнабярэзінскай раўніны. Найб. прыток Пацэя (левы) і верхнія цячэнне К. каналізаваныя. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 1,7 $м^3/сек$. К.— водапрыёмнік пры асушэнні балот.

КАСА́НДРА, род вечназялёных кусцікаў, тое, што *балотны мірт*.

КАСА́НДРА (Kassándra), у стараж.-грэч. эпасе дачка траянскага цара Прыяма. Закаханы ў К. Апалон надзяліў яе дарам прароцтва, але, адхілены ёю, зрабіў так, што прадказанням К. ніхто не верыў, хоць яны заўсёды збываліся. К. дарэмна прадказвала пагібель Троі. Пасля захопу Троі грэкамі трапіла ў палон да Агамемнана, разам з ім забіта яго жонкай Клітэмнестрай.

КАСАРЫ, вёска ў Вялікадолецкім с/с Ушацкага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр саўгаса «Касары». За 32 *км* на ПдЗ ад Ушачаў, 140 *км* ад Віцебска, 25 *км* ад чыг. ст. Лепель. 263 ж., двароў 75 (1971). Лясніцтва. Пач. школа, дзіцячыя яслі-сад, вет. ўчастак, сталовая, магазін.

КАСАРЭЎШЧЫНА, вёска ў Свячанскім с/с Бешанковіцкага р-на Віцебскай вобл., на р. Свяча. Цэнтр калгаса «Дружба». За 10 *км* на З ад Бешанковіч, 61 *км* ад Віцебска, 28 *км* ад чыг. ст. Чашнікі, каля аўтамаб. дарогі Віцебск — Лепель (0,5 *км*). 108 ж., гасп. 33 (1971). Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

КАСА́ТКІН Мікалай Аляксеевіч [13(25).12.1859, Масква — 17.12.1930], рускі савецкі жывапісец. Нар. мастак РСФСР (1923), правадз. чл. АМ (1903). У 1873—83 вучыўся ў Маск. вучылішчы жывапісу, ваяння і дойлідства (у В. Пярова і І. Пранішнікава), дзе выкладаў у 1894—1917. Чл. Т-ва маст. перасоўных выставак (з 1891) і АМРР (з 1922). Адзін з першых праўдзіва адлюстраваў жыццё і рэвалюц. барацьбу рус. пралетарыяту («Шахцёрка», 1894; «Вуглякопы. Змена», 1895; «Шахцёр - цягальнік», 1896; «Рабочы-баявік», 1905; «Работніцы атакуюць завод», 1906; і інш.). Стварыў вобразы новага сав. чалавека («Камсамолка - піянерважатая», 1925; і інш.). У Дзярж. маст. музеі БССР 14 работ мастака, у т. л. «Шахцёр з лямпачкай», 1895.



Літ.: Ситник К. А., Н. А. Касаткин, М., 1955; Серова Г. Николай Алексеевич Касаткин, Л., 1970.



М. А. Касаткін. Шахцёр з лямпачкай. 1895. Дзярж. маст. музей БССР.

КАСАТО́НАЎ Іван Міхайлавіч [н. 12(25).9.1913, в. Лясні Белгародскага пав. Курскай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). У Чырв. Арміі з 1936. На фронце з 1941. Вызначыўся ў Віцебскай вобл. 23.6.1944. Стралк. ўзвод на чале з К. авалодаў ст. Язвіна, захапіў 2 варожыя танкі з экіпажамі; 26.6. 1944 каля Віцебска разграміў варожую калону з 25 аўтамашын і 70 падвод, вызваліў 180 сав. грамадзян, якіх гітлераўцы гналі ў Германію. Жыве ў Тамбове.

КАСА́ЦЫЯ (позналац. cassatio адмена), абскарджанне і апратэставанне рашэнняў і прыгавораў суда, якія не набылі яшчэ законнай сілы. Адна з формаў нагляду вышэйшага суда за дзейнасцю ніжэйшых.

Каб выпраўляць магчымыя суд. памылкі пры разглядзе грамадз. і крымін. спраў і абараняць законныя інтарэсы ўдзельнікаў суд. працэсу, уведзена праверачная стадыя — касацыйнае судаводства. Вышэйшы суд па скаргах бакоў або пратэсце пракурора правярае ўсе матэрыялы справы і на аснове іх, а таксама пададзеных са скаргамі і пратэстамі новых матэрыялаў вырашае пытанне пра законнасць і абгрунтаванасць рашэння, прыгавору, вызначэння або пастановы ніжэйшага суда. Вышэйшы суд мае права часткова змяніць прыгавор, адмяніць яго, перадаць справу на новы разгляд або спыніць яе. У буржуазным праве суд перагладае справы толькі ў межах парушэнняў, якія паказвае той, хто скардзіцца. Такі парадак не гарантуе выпраўлення ўсіх памылак, якія дапусціў суд першай інстанцыі.

Кр.: Грамадзянскі працэсуальны кодэкс Беларускай ССР, Мн., 1965, разд. 4; Крымінальна-працэсуальны кодэкс Беларускай ССР, Мн., 1961, разд. 5.

Літ.: Гражданский процесс, М., 1968; Строгович М. С. Курс советского уголовного процесса, т. 2, М., 1970.

КАСА́Ч (Iris), род шматгадовых травяністых раслін сям. касачовых. Каля 200 відаў, пераважна ў Паўн. паўшар'і. У СССР 58, у БССР 3 дзікарослыя і 20 (320 сартоў) садовых.



Касач сібірскі.

Усе К.— карэнішчавыя расліны. Лісце мечападобнае ці лінейнае. Кветкі фіялетавыя, сінія, жоўтыя, белыя, ружовыя, ярка-чырвоныя. Плод — трохгранная каробачка. На Беларусі найб. вядомы К. жоўты (I. pseudacorus, нар. назвы: косіца, касарыкі, вужачкі, кошыц), расце па берагах азёраў, на балотах; К. сібірскі (I. sibirica, нар. назвы: касіца, дзікія агуркі, калацец) — на лугах. Карэнішчы некат. відаў маюць эфірны алей, які выкарыстоўваецца ў парфумерыі і ў медыцыне.

Літ.: Родионенко Г. И. Род ирис — IRIS L., М.— Л., 1961.

КАСА́Ч Аляксандр Канстанцінавіч (н. 24.4.1918, в. Пастушонкі Полацкага пав.), беларускі савецкі вучоны ў галіне гісторыі медыцыны. Засл. ўрач БССР (1964). Канд. мед. н. (1968), дацэнт (1969). Чл. КПСС з 1949. Скончыў Мінскі мед. ін-т (1948). З чэрв. 1941 на фронце, з мая 1942 у партызанах, з крас. 1943 да ліп. 1944 нач. штаба партызанскай брыгады 2-й Дрысенскай Віцебскай вобл. Нач. 4-га Гал. ўпраўлення Мін-ва аховы здароўя БССР (з 1957), адначасова заг. курса (з 1959), з 1966 заг. кафедры сац. гігіены і арганізацыі аховы здароўя Бел. ін-та ўдасканалення ўрачоў. Асн. працы па даследаванні развіцця медыцыны, санітарыі і гігіены ў дарэвалюц. Мінску; па паляпшэнні работы органаў аховы здароўя і лячэбна-прафілакт. устаноў. Узнаг. 5 ордэнамі, медалямі.

Тв.: У кн.: Вопросы истории медицины и здравоохранения БССР, Мн., 1965; Развитие научной медицинской мысли в дореволюционном Минске, «Здравоохранение Белоруссии», 1967, № 5.

КАСА́Ч Павел Мікалаевіч [н. 8(20).11.1887, с. Рогава Вілейскага пав. Віленскай губ.], беларускі савецкі дзеяч самадзейнага музычнага мастацтва, педагог. Засл. дз. культуры БССР (1957). Скончыў Магілёўскі пед. ін-т (1938). У 1912—56 настаўнічаў. Вядомы як стваральнік і кіраўнік самадзейных хораў. Творчы шлях пачаў у 1907 у капэле Дз. Агрэнева-Славянскага. У 1946 арганізаваў хор студэнтаў у Нясвіжскім пед. вучылішчы, у 1952 — хор у калгасе «1 Мая» Нясвіжскага р-на (з 1963 хор мае званне народнага). З песень К.: «Мой Нёман», «Беларусь мая», «Шумі, Ленін светлую даў нам дарогу» і інш.

КАСЕКА́НС, адна з *трыганаметрычных функцый*, вызначаецца як $\operatorname{cosec} x = \frac{1}{\sin x}$, дзе x — аргумент.

КАСІЁР Станіслаў Вікенцьевіч [6(18).11.1889, г. Венграў Седлецкай губ.— 26.2.1939], савецкі парт. і дзярж. дзеяч. З рабочых. Чл. КПСС з 1907. Вёў рэвалюц. работу ў Данбасе, Харкаве, Кіеве, Маскве. У 1907—15 няраз арыштоўваўся. Пасля Лют. рэв. 1917 чл. Петраградскага к-та і Выканаўчай камісіі Петраградскага к-та РСДРП(б). Удзельнік Кастр. ўзбр. паўстання, камісар Петраградскага ВРК. З 1918 сакратар падпольнага Прыбалтыйскага к-та КП(б)У; узначальваў Захфронтбюро ЦК КП(б)У. У 1919—25 сакратар ЦК КП(б)У; сакратар Сіббюро ЦК РКП(б). У 1925—28 сакратар ЦК ВКП(б); у 1928—38 ген. сакратар ЦК КП(б)У. З 1938 нам. старшыні СНК СССР і старшыня Камісіі сав. кантролю. На XII з'ездзе РКП(б) выбіраўся канд. у чл. ЦК, на XIII—XVII чл. ЦК ВКП(б). З 1927 канд. у чл. Палітбюро, у 1930—38 чл. Палітбюро ЦК ВКП(б). Чл. Прэзідыума ЦВК СССР. Дэп. Вярх. Савета СССР 1-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна.



Літ.: Мельчин А. И. Станислав Косиор, М., 1964.

КАСІЛАВІЧЫ, вёска ў Бараўскім с/с Дзяржынскага р-на Мінскай вобл. Да 1969 цэнтр калгаса імя Кірава. За 6 *км* на ПдЗ ад Дзяржынска, 44 *км* ад Мінска, 7 *км* ад чыг. ст. Койданава, каля аўтамагістралі Масква — Брэст (1,5 *км*). 161 ж., двароў 46 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка.

КАСІЛКА, с.-г. машына для скошвання травяністых раслін. Бываюць простыя, якія толькі косяць, і камбінаваныя, якія косяць і плюшчаць траву, каб паскорыць яе сушку (К.-плюшчылкі), або крышаць траву і падаюць яе ў транспартныя сродкі (К.-крышылкі). Бываюць навясныя, прычапныя і самаходныя, падзяляюцца на пракосныя (укладваюць скошаную траву ў пракос) і валковыя (збіраюць у валкі).



Касілка аднабрусавая навясная КС-2,1.

Асн. рабочы орган К.— рэзальны апарат, які прыводзіцца ў дзеянне ад вала адбору магутнасці трактара ці ад хадавых колаў (у прычапных). Паводле канструкцыі ён бывае двух тыпаў — сегментавы, са аваротна-паступальным рухам нажоў, і ратацыйны, з вярчэннем нажоў у вертыкальнай (барабанны) ці ў гарызантальнай (дыскавы) плоскасці. На Беларусі выкарыстоўваюцца К. з сегментавым і барабанным рэзальнымі апаратамі: трактарныя К-2,1М, КС-2,1, КСП-2,1А (шырыня захопу 2,1 *м*), КДП-4 і конная К-1,4. К.-крышылкі і К.-плюшчылкі выкарыстоўваюцца для падрыхтоўкі сенажу, а таксама (К.-крышылкі) на нарыхтоўцы вялёнай падкормкі і ўборцы сіласных культур. На невялікіх цяжкадаступных мясцінах ужываецца К. з франтальным рэзальным апаратам КНФ-1,6.

Літ.: Сабликов М. В. Сельскохозяйственные машины, ч. 1, М., 1968. *І. І. Півуноўскі.* Мінск.

КАСІЛЫ, вёска ў Лунненскім с/с Мастоўскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса імя Куйбышава. За 30 *км* на З ад Мастоў, 49 *км* ад Гродна, 9 *км* ад чыг. ст. Чарлёна, на аўтамаб. дарозе Ваўкавыск — г. п. Скідаль. 138 ж., гасп. 48 (1971). Клуб, б-ка, магазін. Помнік на Кургане Бессмяротнасці 74 сав. воінаў-аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

КАСІЛЬ Леў Абрамавіч [27.6(10.7).1905, слабада Пакроўская Самарскай губ.— 21.6.1970], рускі савецкі пісьменнік. Чл.-кар. Акадэміі пед. навук СССР (1965). З сям'і ўрача. Друкавацца пачаў у 1925. Першыя кн. для дзяцей — аўтабіягр. аповесці «Кандуіт» (1930) і «Швамбранія» (1933). Аптымізм, лірызм у спалучэнні з гумарам і сатырай уласцівыя творчасці К. Аўтар аповесцей і раманаў «Варатар рэспублікі» (1938), «Чарамыш, брат героя» (1938), «Вялікае процістаянне» (1941—47), «Вуліца малодшага сына» (1949, з М. Паляноўскім; Дзярж. прэмія СССР 1950; экранізацыя «Беларусьфільмам» 1962), «Ранні ўсход» (1953), «Будзьце гатовы, ваша вялікасць!» (1964, аднайменная п'еса з П. Хомскім паст. Бел. т-рам юнага гледача, 1965), кнігі «Маякоўскі — сам» (1940, 2-е дап. выд. 1960) і інш. Узнаг. 4 ордэнамі, медалямі.

Тв.: Собр. соч., т. 1—5, М., 1965—66; бел. пер.— Ільдзіна-халадзіна, 2 выд., Мн., 1937; Турэцкія буцы, Мн., 1937; Кандуіт і Швамбранія, Мн., 1939; Дарагія мае хлапчукі, Мн., 1947; Выбуховы груз і іншыя апавяданні, Мн., 1947; Пра жыццё зусім добрае, Мн., 1962.

Літ.: Николаев В. Дорогами мечты и поиска. Творческий путь Льва Кассиля, М., 1965.

КАСІНЕРЫ, польскія сяляне-апалчэнцы ў час паўстання 1794, узброеныя косамі, насаджанымі вертыкальна. Былі аб'яднаны ў батальёны і ў полк кракаўскіх грэнадзёраў. На тэр. Літвы і Беларусі атрады К. фарміраваліся ў час паўстанняў 1830—31 і 1863—64, але замест кос мелі на кіях палосы жалеза.

КАСІТЭРЫТ (ад грэч. kassiteros волава), алавяны камень, мінерал, вокіс волава SnO_2. Руда на волава.

Змяшчае 79% Sn, прымесі Fe, Ta, Nb, Sc, In, Mn і W. Крышталізуецца ў тэтраганальнай сістэме. Крышталі дыпірамідальныя, прызматычныя, радзей ігольчастыя; агрэгаты зярністыя, радыяльна-прамяністыя. Колер жаўтавата-карычневы, карычневата-чорны, вродку бясколерны. Бляск алмазны, тлусты. Цв. 6—7,0; шчыльн. 6800—7000 *кг/м*³. Крохкі. Паходжанне пегматытавае, пнеўматалітава-гідратэрмальнае; трапляецца ў россыпях. Радовішчы ў СССР (Усх. і Паўн.-Усх. Сібір, Сярэдняя Азія), Малайзіі, Тайландзе, Бірме, Балівіі і інш.

КАСІЯН Васіль Ільіч (н. 1.1.1896, с. Мікулінцы Снятынскага пав. ў Галіцыі), украінскі савецкі графік. Нар. мастак СССР (1944). Правадз. чл. АМ СССР (1947). Член КПСС з 1946. Вучыўся ў АМ у Празе ў М. Швабінскага (1920—26). Аўтар гравюр, літаграфій, рысункаў, прысвечаных гісторыі ўкр. народа, грамадз. вайне, сацыялістычнаму буд-ву на Украіне, Вял. Айч. вайне: «Карпацкая маці» (1924), «Вугальшчыкі» (1926), «Перакоп» (1927), «Днепрабуд» (1932), «Арцём» (1936); серыі эстампаў «Т. Р. Шаўчэнка» (1923, 1926, 1934, 1959, 1960, 1961) і «Шаўчэнка і народ» (1964—65); серыі афортаў «Ленін і Украіна» (1947). Узнаг. ордэнам Леніна, 3 інш. ордэнамі.

Літ.: Гравюры Василия Касияна, М., 1968.

КАСІЯПЕЯ (лац. Cassiopeia, пар. назва Касцы), сузор'е паўн. паўшар'я неба. 5 найбольш яркіх зорак К. размешчаны ў выглядзе расцягнутай літары W (гл. *Зорнае неба*). На тэр. БССР відаць круглы год.

КАСКАД ГІДРАЭЛЕКТРАСТАНЦЫЙ, група *гідраэлектрычных станцый*, якія размешчаны па цячэнні воднага патоку і выкарыстоўваюць яго энергію паслядоўна; станцыі звычайна звязаны агульным водагаспадарчым рэжымам.

У склад К. г. могуць уваходзіць як прыплаціныя, так і дэрывацыйныя ГЭС. Да найбуйнейшых каскадаў прыплаціных ГЭС належаць Ангарска-Енісейскі (Іркуцкая, Брацкая імя 50-годдзя Вялікага Кастрычніка, Усць-Ілімская, Багучанская, Саянская, Краснаярская), Волжска-Камскі (Волжскія імя XXII з'езду КПСС і імя Леніна, Саратаўская, Ніжне-Камская, Воткінская), Дняпроўскі (Дняпроўская імя Леніна, Крамянчугская, Кіеўская, Канеўская ГЭС); да дэрывацыйных — Севана-Разданскі каскад (у Арменіі). У К. г. паўней выкарыстоўваюцца энергетычныя рэсурсы рэк, па-вышаецца ступень зарэгулявання сцёку, што дае магчымасць павялічыць магутнасць і выпрацоўку ГЭС, на суднаходных ракаў — утварыць скразны водны шлях з павялічанымі глыбінямі.

Літ.: Электрификация СССР, М., 1970.

КАСКАД ЭЛЕКТРАМАШЫННЫ, агрэгат, які складаецца з галоўнай эл. машыны і адной ці больш дапаможных машын, эл. ланцугі якіх злучаны паслядоўна, каб плаўна і эканамічна рэгуляваць скорасць вярчэння ротара гал. машыны.

Найб. пашыраны К. э., які складаецца з гал. асінхроннага рухавіка і пераўтваральнага агрэгата. Паводле віду сувязі паміж імі адрозніваюць К. э. электрычны (рыс. *а*), у якім ротар рухавіка звязаны з пераўтваральным агрэгатам толькі электрычна, і электрамеханічны (рыс. *б*), звязаны і электрычна, і механічна. Эканамічнае рэгуляванне скорасці вярчэння гал. асінхроннага рухавіка ў К. э. адбываецца ўвядзеннем у ланцуг ротара дадатковай эрс, частата якой роўнай частаце эрс ротара. Геам. складанне дадатковай эрс і эрс ротара дае магчымасць адначасова рэгуляваць скорасць вярчэння і зменьваць каэф. магутнасці гал. асінхроннага рухавіка. К. э. выкарыстоўваюцца ў магутных прамысл. установах, дзе трэба плаўна рэгуляваць скорасць у шырокіх межах, напр. у прыводах бесперапынных пракатных станаў, буйных паветрадзьмулак, вентылятараў для шахтаў і аэрадынамічных трубаў.

Схема электрамашыннага каскада: *а* — электрычны каскад; *б* — электрамеханічны каскад; РМ — рабочая машына; АР — галоўны асінхронны рухавік; КМ — калектарная машына пераменнага току; ДАМ — дапаможная асінхрон. машына.



Літ.: Андреев В. П. и Сабинин Ю. А. Основы электропривода, 2 изд., М.— Л., 1963; Петров Г. Н. Электрические машины, ч. 3, М.—Л., 1968.

Б. І. Фірага. Мінск.

КАСМАГОНІЯ (ад *космас*+грэч. goneia зараджэнне), раздзел *астраноміі*, які вывучае паходжанне і развіццё касмічных целаў і іх сістэм. Падзяляецца на планетную, зорную К. і К. галактык. Выкарыстоўвае вынікі эксперыментальнай і тэарэт. фізікі, назіральнай астраноміі, астрафізікі.

Пачатак навук. К. дадзены ў 18 ст. працамі І. Канта і П. Лапласа. Іх небулярная (ад лац. nebula туманнасць) гіпотэза апісвала ўзнікненне Сонца і планет з першаснай туманнасці, якая вярцелася. Паводле Лапласа, туманнасць сціскалася, і з яе ўтварыўся «зародак» Сонца з кольцамі вакол яго. Неаднароднасці размеркавання рэчыва ў кольцах абумовілі іх кандэнсацыю ў планеты. Хаця ідэя першаснай туманнасці не тлумачыла многіх з'яў (напр., вялікіх памераў планетнай сістэмы ў параўнанні з Сонцам), яна прызнавалася вучонымі да пач. 20 ст. У 1916 стала вядома гіпотэза англ. астранома Дж. Джынса, які лічыў, што планеты ўтварыліся з рэчыва, вырванага з Сонца прыцягненнем воркі, якая праляцела паблізу. Амер. астраном Г. Рэсел (1935) даказаў неабгрунтаванасць такой гіпотэзы. Развіццё сучаснай планетнай К. звязана перш за ўсё з імем сав. вучонага О. Ю. Шміта. У 1943 ён прапанаваў ідэю акумуляцыі Зямлі і планет з халоднага рэчыва. Гэта ідэя распрацоўвалася ім і яго супрацоўнікамі і стала тэорыяй.

Паводле тэорыі Шміта, наша планетная сістэма ўтварылася 4,5—5 млрд. гадоў назад з газава-пылавога пратапланетнага воблака, якое акружала Сонца. Спачатку з пылавой кампаненты воблака ўтварылася мноства целаў памерам да соцень *км*. Потым з рою гэтых прамежкавых целаў, падобных на сучасныя астэроіды і ядры камет, акумуліраваліся планеты. Такі працэс іх утварэння дае магчымасць растлумачыць механічныя заканамернасці руху і дзяленне планет на дзве групы, якія розняцца складам і масаю (гл. *Сонечная сістэма*).

Планеты зямной групы першапачаткова былі адносна халодныя, а пасля іх нетры паступова разаграваліся ад цяпла, якое вылучаецца пры распадзе радыеактыўных элементаў, што ёсць у невялікай колькасці ва ўсіх пародах. Гэта прывяло да выплаўлення кары і выдзялення газаў і пары. Газы і пара Месяца, Меркурыя і Марса поўнасцю або ў значнай меры рассеяліся ў прасторы, на Зямлі ўтварылі атмасферу і гідрасферу, а на Венеры — толькі атмасферу. Развіццё фізікі і астрафізікі ў 20 ст. дало магчымасць пачаць вывучэнне паходжання і эвалюцыі зорак і зорных скопішчаў. Большасць даследчыкаў


1



2


3


4


5

6

7

8

Касманаўтыка I.

1. Першы ў свеце савецкі штучны спадарожнік Зямлі, запушчаны ў космас 4 кастрычніка 1957. 2. Першы ў свеце савецкі лётчык-касманаўт Ю. А. Гагарын перад стартам. 3. Першая ў свеце жанчына-касманаўт В. У. Нікалаева-Церашкова (тэлевізійнае адлюстраванне, атрыманае з касмічнага карабля «Усход-6»). 4. Касмічны карабель «Усход». 5. Вымпел, дастаўлены 1 красавіка 1966 на паверхню Венеры савецкай аўтаматычнай станцыяй «Венера-3». 6. Выхад у адкрыты космас савецкага лётчыка-касманаўта А. А. Лявонава. 7. Амерыканскі касманаўт Э. Олдрын на Месяцы. 8. Спускальны апарат аўтаматычнай міжпланетнай станцыі «Венера-7».











Касманаўтыка II.

1. Ракета з касмічным караблём «Саюз» (устаноўка на стартавую пляцоўку).
2. Рабочы адсек касмічнай арбітальнай станцыі «Салют».
3. Макет касмічнай сістэмы «Саюз» — «Салют».
4. Грунт з Месяца, дастаўлены аўтаматычнай станцыяй «Месяц-16» на Зямлю.
5. Савецкі самаходны апарат «Месяцаход-1».

зорнай К. дапускае, што зоркі ўтвараюцца з газава-вадародных туманнасцей і выпраменьваюць за кошт працэсаў гравітацыйнага разагрэву і тэрмаядзернага сінтэзу. В. А. Амбарцумян мяркуе, што зоркі маглі ўтварыцца з нейкага, пакуль невядомага, звышшчыльнага рэчыва. Параўнальна нядаўна пачала распрацоўвацца К. галактык. Даследуюцца розныя мадэлі паходжання галактык; праводзіцца іх класіфікацыя паводле структуры і месца ў звалюц. паслядоўнасцях. Высвятленне пытанняў К.— неабходны момант у фарміраванні навук. матэрыялістычнага светапогляду. Гл. таксама *Касмалогія*.

Літ.: Шмидт О. Ю. Происхождение Земли и планет, М., 1962; Амбарцумян В. А. и др. Проблемы современной космогонии, М., 1969; Воронцов-Вельяминов Б. А. Очерки о Вселенной, 6 изд., М., 1969; Левин Б. Ю. Происхождение Земли и планет, 4 изд., М., 1964.

Б. Ю. Левін. Масква.

КАСМАДЗЯМ'ЯНСКАЯ Зоя Анатолеўна (Таня; 13.9.1923, в. Асінавыя Гаі Тамбоўскай губ.— 29.11.1941), савецкая партызанка, Герой Сав. Саюза (1942). З служачых. Чл. ВЛКСМ. У кастр. 1941 вучаніца 10-га кл. 201-й маск. школы К. добраахвотна пайшла ў знішчальны партыз. атрад. У ліст. 1941 у час выканання баявога задання ў варожым тыле схоплена гітлераўцамі ў в. Пятрышчава Верайскога р-на Маск. вобл. і пасля жорсткіх катаванняў павешана. Помнікі К. на Мінскай шашы каля в. Пятрышчава і ў інш. нас. пунктах.



Літ.: Героини, в. 1, М., 1969, с. 283—292; Космодемьянская Л. Повесть о Зое и Шуре, М., 1966.

КАСМАДРОМ, тэрыторыя з комплексам стартавых і тэхналагічных збудаванняў і вымяральных пунктаў, дзе адбываецца зборка, падрыхтоўка і запуск *касмічных лятальных апаратаў*, траекторныя вымярэнні іх палёту, падача камандаў, прыём і апрацоўка тэлеметрычнай інфармацыі. Вялікія К. абсталяваны чыгункай, маюць шашэйныя, водныя і паветр. шляхі зносін. Некаторыя К. маюць «зоны адчужэння» для падзення адпрацаваных ракет-носьбітаў. Адзін з найбуйнейшых К. СССР — *Байканур*.

Асн. аб'екты К. (гл. рыс.): тэхн. пазіцыя, стартавыя комплексы і станцыі камандна-вымяральнага комплексу. Тэхн. пазіцыя — комплекс збудаванняў з абсталяваннем для хавання, зборкі і выпрабаванняў ракет-носьбітаў і касм. аб'ектаў, запраўкі касм. аб'ектаў і прыстыкоўкі іх да ракет-носьбітаў. На тэхн. пазіцыі размешчаны: мантажна-выпрабавальныя карпусы ракет-носьбітаў і касм. аб'ектаў, заправачная і кампрэсарная станцыі, трансфарматарная падстанцыя і службовыя будынкі. Для ракет-носьбітаў з цвёрдапаліўнымі паскаральнікамі ў склад тэхн. пазіцыі дадаткова ўваходзяць першаснае сховішча секцыі цвёрдапаліўных паскаральнікаў, будынак іх агляду, сховішча гатовых да выкарыстання секцый, будынак зборкі і прыстыкоўкі цвёрдапаліўных паскаральнікаў. Пасля праверкі правільнасці стыкоўкі і кабельных сувязей ракеты-носьбіта з касм. аб'ектам сабраная ракетна-



Макет касмадрома:
А, Б, В — стартавыя пазіцыі касмадрома; Г — тэхнічная пазіцыя; *1* — кабель-заправачная вежа; *2* — вежа абслугоўвання; *3* — станцыя запраўкі палівам касмічных аб'ектаў; *4* — мантажна-выпрабавальны корпус касмічных аб'ектаў; *5* — будынак вертыкальнай зборкі; *6* — кампрэсарная станцыя; *7* — выносны камандны пункт; *8* — сховішча і заправачная станцыя акісляльніка; *9* — рэсіверная станцыя; *10* — басейн з вадой сістэмы пажаратушэння; *11* — камандны пункт; *12* — газаадбівальнік; *13* — газаадводны канал; *14* — пускавая сістэма; *15* — вежа для прылад навядзення ракеты па азімуце; *16* — гусенічны транспарцёр; *17* — радыёлакацыйная станцыя; *18* — укрыццё для разліку; *19* — сховішча і заправачная станцыя паліва; *20* — сховішча і заправачная станцыя вадароду.

касмічная сістэма транспартуецца на стартавую пазіцыю. Стартавы комплекс — збудаванні і спец. тэхнал. абсталяванне для дастаўкі і ўстаноўкі ракетна-касм. сістэм на стартавую пляцоўку, перадстартавых праверак, запраўкі кампанентамі паліва і сціснутымі газамі і запуску. У склад спец. збудаванняў стацыянарнага стартавага комплексу ўваходзяць: пускавое збудаванне, сістэма маланкаадводаў, перасоўная вежа абслугоўвання з пад'язнымі шляхамі ці адкідныя фермы з пляцоўкамі для абслугоўвання, камандны пункт, збудаванні з абсталяваннем для запраўкі ракеты-носьбіта акісляльнікам і палівам. Выкарыстоўваюцца таксама перасоўныя заправачныя агрэгаты. Стартавы комплекс мае некалькі стартавых пляцовак. Пасля таго як запраўка і праверка ракетна-касм. сістэм закончана, усе агрэгаты абслугоўвання адводзяцца. Пры запуску пілотных касм. караблёў пасадка касманаўтаў адбываецца пасля запраўкі з дапамогай ліфтаў у фермах ці вежах абслугоўвання. Усе аперацыі перадстартавай падрыхтоўкі фіксуюцца на пульце пуску. Пасля гатоўнасці ўсіх сістэм даецца каманда «пуск», ключ паварочваецца ў становішча «пуск», і пры націсканні кнопкі «пуск» уключаецца аўтам. схема пуску. Пры ўзнікненні аварыйных абставін схема пуску скідваецца і элементы яе вяртаюцца ў пачатковае становішча. Станцыі камандна-вымяральнага комплексу ўдзельнічаюць у перадстартавых праверках, выдачы камандаў і прыёме тэлеметрычнай інфармацыі пры вывядзенні на арбіту, траекторных вымярэннях палёту ракеты-носьбіта і касм. аб'екта; перадаюць каманды на касм. аб'ект па ўключэнні праграм, якія закладзены ў бартавыя сістэмы і механізмы. Станцыі, размешчаныя на К., уваходзяць у склад агульнай сеткі наземных станцый камандна-вымяральнага комплексу.

Г. Л. Ступін. Масква.

КАСМАЛОГІЯ (*космас+...логія*), вучэнне пра Сусвет як адзінае цэлае і пра ўсю ахопленую назіраннямі вобласць свету як яго частку. К. развівалася як раздзел астраноміі; сучасная К. выкарыстоўвае таксама агульныя палажэнні фізікі, астрафізікі, філасофіі. К. вывучае пытанні аб размеркаванні і руху матэрыі ў прасторы, аб развіцці фіз. карціны Сусвету, геам. ўласцівасці прасторы-часу.

К. мае агульнафіласофскае значэнне, у прыватнасці для абгрунтавання і далейшага развіцця навукова-матэрыялістычнага светапогляду.

Першай спробай уявіць будову *Сусвету* цалкам на аснове назіранняў была геацэнтрычная сістэма свету (гл. *Сістэмы свету*). Па меры развіцця сродкаў і метадаў астраноміі пашыралася ахопленая назіраннямі частка Сусвету, і ў 19 ст. натуральнай мадэллю Сусвету была бесканечная і адналодная ў звычайнай еўклідавай прасторы і нязменная ў часе (стацыянарная) касмалагічная мадэль. Але, як высветлілася, гэтай мадэлі ўласцівы некаторыя прынцыповыя недахопы (фотаметрычны, гравітацыйны парадоксы і інш.). Развіццё сучаснай К. звязана з стварэннем агульнай тэорыі адноснасці (гл. *Адноснасці тэорыя*). У 1922, 1924 сав. вучоны А. А. Фрыдман прапанаваў нестацыянарныя аднародныя ізатропныя мадэлі, у якіх уводзіцца дапушчэнне, прыблізна пацверджанае назіраннямі: сярэдняя шчыльнасць рэчыва ў кожны момант часу ўсюды аднолькавая, а ўсе кірункі ў прасторы эквівалентныя. Усярэдненне пры гэтым праводзіцца па аб'ёме, які змяшчае шмат скопішчаў галактык. Асн. вывад тэорыі Фрыдмана: Сусвет не астаецца нязменным у часе, ён расшыраецца ці сціскаецца. Геам. ўласцівасці прасторы і іх эвалюцыя залежаць ад сярэдняй шчыльнасці рэчыва ρ: калі $\rho<\rho_к$ ($\rho_к$ — крытычная шчыльнасць), свет бесканечны і неабмежавана расшыраецца («адкрытая» мадэль); калі $\rho>\rho_к$, свет замкнёны, яго аб'ём канечны і на некаторым этапе расшырэнне павінна змяніцца сцісканнем («закрытая» мадэль). Паводле сучасных даследаванняў фактычнае значэнне шчыльнасці блізкае да $\rho=2\cdot10^{-29}$ *кг/м*³. *Чырвонае зрушэнне* ў спектрах далёкіх галактык сведчыць пра расшырэнне Сусвету (Э. Хабл, 1929). Наяўнасць неаднароднасцей (галактык і іх скопішчаў), а таксама магчымыя адхіленні ад ізатропіі і аднароднасці на ранніх этапах расшырэння патрабуюць вывучэння анізатропных і неаднародных касмалагічных мадэляў. Усе мадэлі Сусвету з'яўляюцца пэўнай ідэалізацыяй, і пытанне пра тое, якая з іх найб. адпавядае рэчаіснасці, можна вырашыць толькі на аснове назіранняў.

Сучасная К. займаецца таксама вывучэннем фіз. працэсаў на ранніх этапах расшырэння Сусвету, што прывялі да ўзнікнення галактык і зорак. Адкрыццё (1965) рэліктавага цеплавога касмічнага выпрамянення з абс. т-рай 2,7 К, якое ўзнікла мільярды гадоў таму назад, пацвярджае «гарачую» мадэль Сусвету, паводле якой у дагалактычную эпоху матэрыя знаходзілася ў шчыльным стане і мела высокую т-ру. Паслядоўная фіз. тэорыя стану Сусвету ў пачатку расшырэння адсутнічае, і шэраг звязаных з ёю пытанняў астаецца нявырашаны. Гл. таксама *Астраномія, Астрафізіка, Касмагонія, Астранамічныя часопісы.*

Літ.: Зельдович Я. Б. и Новиков И. Д. Релятивистская астрофизика. М., 1967; Гинзбург В. Л. Современная астрофизика. М., 1970; Казютинский В. В. Философские проблемы космологии. М., 1970. *А. В. Мінкевіч.* Мінск.

КАСМАНАЎТЫКА, палёты ў касмічную прастору; сукупнасць галін навукі і тэхнікі, якія забяспечваюць асваенне космасу і пазаземных аб'ектаў для патрэб чалавецтва з выкарыстаннем розных касмічных апаратаў [ракет, штучных спадарожнікаў планет і Месяца, касм. караблёў (КК), арбітальных станцый, аўтаматычных міжпланетных станцый (АМС), стацыянарных і мабільных апаратаў на нябесных целах і інш.]. К. ўключае праблемы: тэорыі касм. палётаў — разлікі траекторый і інш.; навук.-тэхн. канструяванне касм. ракет,



Алея герояў космасу ў Маскве.

рухавікоў, бартавых сістэм кіравання, пускавых збудаванняў, аўтам. станцый і пілотных караблёў, навук. прылад, наземных сістэм кіравання палётамі, службаў траекторных вымярэнняў, тэлеметрыі, арганізацыі і забеспячэння арбітальных станцый і інш.; медыка-біялагічныя — стварэнне сістэм жыццезабеспячэння, кампенсацыя неспрыяльных з'яў у чалавечым арганізме, звязаных з перагрузкай, бязважкасцю, радыяцыяй і інш.; юрыдычныя — міжнародна-прававое рэгуляванне пытанняў выкарыстання касм. прасторы, планет.

Пачатак касм. эры — 4.10.1957, калі ў СССР быў запушчаны першы *штучны спадарожнік Зямлі* (ШСЗ). Другая найважнейшая дата касм. эры — 12.4.1961 — дзень першага касм. палёту Ю. А. *Гагарына* — пачатак эпохі непасрэднага пранікнення чалавека ў космас. Трэцяя важная падзея К. — першая экспедыцыя на Месяц — 16—24.7.1969, якую выканалі Н. *Армстранг*, Э. *Олдрын* і М. *Колінз* (ЗША). Сродкі вывядзення апаратаў у космас створаны і выкарыстоўваюцца ў краінах: СССР з 1957, ЗША з 1958, Францыі з 1965, Японіі і КНР з 1970. На 1.1.1972 колькасць сав. штучных спадарожнікаў, АМС і КК дасягнула 580. Аналагічны маштаб работ па К. вядзецца ў ЗША. На гэту дату касм. палёты ажыццявілі 25 сав. касманаўтаў на 18 КК і 30 амер. касманаўтаў на 25 КК; запушчана ШСЗ: Вялікабрытаніяй — 7, Францыяй — 7, Японіяй — 3, КНР — 2.

Тэарэт. абгрунтаванне магчымасці палётаў у касм. прастору ўпершыню даў рус. вучоны К. Э. *Цыялкоўскі* ў канцы 19 ст. У сваіх працах ён паказаў рэальнасць тэхн. ажыццяўлення касм. палётаў і даў прынцыповае рашэнне шэрагу асн. праблем К. Акрамя Цыялкоўскага пытаннямі К. былі прысвечаны працы І. У. Мяшчэрскага (з 1897), Ю. В. Кандрацюка (1919—29), Ф. А. *Цандэра* (1924—32) і інш. рус. вучоных. За мяжой працы па К. апублікавалі Р. Эно-Пельтры (Францыя, 1913), Р. Годард (ЗША, 1919), Г. Оберт (Германія, 1923). Былі заснаваны першыя т-вы К.: у СССР (1924), Аўстрыі (1926), Германіі (1927), Вялікабрытаніі і ЗША (1930). Мэтай гэтых т-ваў была прапаганда ідэй К. і садзейнічанне вырашэнню практ.



Макет аўтаматычнай станцыі «Месяц-16» у павільёне «Космас» ВДНГ СССР.

праблем у гэтай галіне. У СССР практ. работы ў галіне ракетнай тэхнікі пачаліся ў 1921, калі была арганізавана Газадынамічная лабараторыя (ГДЛ). З 1928 пад кіраўніцтвам М. І. Ціхамірава (заснавальніка ГДЛ) вялася лётныя выпрабаванні ракет на бяздымным шашачным пораху. З 1929 у ГДЛ В. П. *Глушко* пачаў распрацоўку ракет з электрычным (ЭРР) і вадкасным (ВРР) ракетнымі рухавікамі. Першыя выпрабаванні ЭРР праведзены ў 1929, ВРР — у 1931. У 1932 у Маскве была створана Група вывучэння рэактыўнага руху (рус. ГІРД), дзе ў 1933 адбыліся першыя пускі сав. вадкасных ракет канструкцыі М. К. Ціханравава і Ф. А. Цандэра. У 1933 на базе ГДЛ і ГІРД заснаваны Рэактыўны н.-д. ін-т. Гэтыя арг-цыі зрабілі асн. ўклад у стварэнне ракетнай і касм. тэхнікі ў СССР. Заснавальнік практычнай К.— С. П. *Каралёў*. Пад яго кіраўніцтвам створаны ракетна-касмічны комплекс, які даў магчымасць запусціць у 1957 першы ШСЗ, потым быў ажыццёўлены вывад на каляземныя арбіты шэрагу аўтам. кіроўных *касмічных апаратаў* (КЛА), да 1961 быў адпрацаваны і запушчаны касм. карабель «Усход», на якім Ю. А. Гагарын ажыццявіў свой палёт. С. П. Каралёў кіраваў распрацоўкай шэрагу інш. КЛА, ажыццяўляў агульнае тэхн. кіраўніцтва работамі па забеспячэнні першых касм. праграм, непасрэдна ўдзельнічаў у стварэнні *касмадрома*, пунктаў касм. сувязі, службы ратавання і эвакуацыі, кіравання палётамі, падрыхтоўкі касманаўтаў.

У ЗША эксперым. працы з ВРР пачаў праводзіць Годард у 1921, а пускі вадкасных ракет — з 1926. У Германіі стэндавыя выпрабаванні рухавікоў гэтага класа пачаў праводзіць Оберт у 1929, а лётныя выпрабаванні вадкасных ракет — І. Вінклер з 1931. У час 2-й сусв. вайны Германія выкарыстоўвала вадкасныя ракеты з далёкасцю лёту 250—300 км (ракета V-2 канструкцыі В. фон Браўна). Патэнцыяльныя магчымасці новай зброі стымулявалі фарсіраванне прац па ракетнай тэхніцы ў многіх краінах пасля вайны, у выніку чаго былі створаны міжкантынентальныя і інш. балістычныя ракеты. Гэтыя працы спрыялі стварэнню неабходнай тэхнічай базы К.

Сучасная тэорыя касм. палётаў заснавана на нябеснай механіцы і тэорыі кіравання рухам ляцельных апаратаў. У адрозненне ад класічнай нябеснай механікі новы кірунак наз. астрадынамікай. К. патрабавала распрацоўкі аптымальных траекторый КЛА з улікам эвалюцыі гэтых траекторый пад уздзеяннем узбуральных сіл. Патрабаванне аптымальнасці вядзе да даволі складаных траекторый — з доўгімі перапынкамі ў рабоце рухавікоў посьбіта (напр., пры старце да Месяца, Марса, Венеры ажыццяўляецца вывад КЛА на траекторыю ШСЗ і потым толькі да планеты) і з выкарыстаннем гравітацыйнага поля планеты (напр., пры палёце да Месяца з мэтай выгіну траекторыі, неабходнага для вяртання да Зямлі без запуску ракетнага рухавіка). Важны раздзел прыкладной нябеснай механікі — тэорыя карэкцыі траекторыі палёту. Адхіленне фактычнай траекторыі ад разліковай звязана з 2 фактарамі: скажэнне траекторыі ўзбуральнымі сіламі, якія немагчыма ўлічыць загадзя (напр., тармажэнне ШСЗ атмасферай, шчыльнасць якой мяняецца нерэгулярна), і непазбежнымі пры тэхн. рэалізацыі малымі памылкамі ў скорасці і напрамку палёту КЛА ў момант уключэння рухавікоў посьбіта (эфект памылак паступова нарастае пры міжпланетных палётах). Карэкцыя адбываецца пры кароткачасовым уключэнні ракетнага рухавіка для папраўкі траекторыі.

Стварэнне ракетна-касм. комплексаў — важная навук.-тэхн. праблема. Сучасная ракета-носьбіт (РН) — складаны комплекс прыстасаванняў, аснoўныя з якіх — рухальная ўстаноўка і сістэма кіравання. Вялікія РН дасягаюць стартавай масы больш за 3000 *т* і даўжыні звыш 100 *м*. Для размяшчэння ў іх патрэбных запасаў паліва (90% поўнай масы) канструкцыя ракет павінна быць надзвычай лёгкай. У палёце, па меры расходавання паліва, апарожненыя часткі бакаў становяцца лішнімі, іх разгон патрабуе неапраўданага выдаткавання паліва, таму мэтазгодна ствараць шматступеньчатыя канструкцыі РН; ступені ракет адкідваюцца паслядоўна, пасля апаражнення бакаў. Звычайна выкарыстоўваюцца хім. вадкасныя ракетныя рухавікі, эрэдку — на цвёрдым паліве; рухавікі, заснаваныя на выкарыстанні ядз. энергіі, знаходзяцца ў стадыі эксперым. даследавання. Рухальныя ўстаноўкі РН складаюцца з некалькіх *ракетных рухавікоў*, сінхранізацыя работы якіх вядзецца сістэмай кіравання. Сістэмы кіравання рухам звычайна аўтаномныя — працуюць без умяшання наземных пунктаў.

Гатоўнасць РН да пуску правяраецца на тэхн. пазіцыі касмадрома, потым ракета транспартуецца на стартавую пляцоўку, дзе ўстанаўліваецца на пускавую сістэму, праводзяцца перадстартавыя выпрабаванні, запраўка бакаў палівам і пуск. Вывядзенне КЛА лічыцца закончаным, калі перавышана першая касм. скорасць (каля 7,91 км/сек) для ШСЗ і дасягнута скорасць парадку другой касмічнай (11,9 км/сек) для апаратаў, якія ляцяць да Месяца, Марса ці Венеры; для палёту да далёкіх планет ці Сонца неабходна развіць скорасць, значна большую за другую касмічную.

Для самастойнага функцыянавання ва ўмовах касм. прасторы КЛА павінны мець шэраг сістэм: сістэму, якая падтрымлівае зададзены тэмпературны рэжым; энергасілкавання; паліва; сувязі з Зямлёй і іншымі КЛА; кіравання рухам. Акрамя таго, на борце ўстанаўліваецца навук. апаратура. Усе прылады і сістэмы аб'яднoўваюцца сістэмай кіравання бартавым комплексам, якая ўзгадняе іх работу. Для пілотных КЛА неабходна забяспечыць экіпажу засцярогу ад касм. асяроддзя (вакуум, касм. выпрамяненне і інш.) і мець сістэму жыццезабеспячэння. Палёт у космасе ставіць павышаныя патрабаванні да чалавечага арганізма (уплыў бязважкасці, перагрузак пры ўзлёце і пасадцы і інш.), таму неабходны мед. адбор касманаўтаў. Пытанне пра доўгае знаходжанне чалавека ва ўмовах бязважкасці яшчэ не вырашана. Калі гэта будзе не-

Мяккая пасадка касмічнага карабля «Саюз-9» з касманаўтамі А. Р. Нікалаевым і В. І. Севасцьянавым.



магчыма, з'явіцца неабходнасць ствараць штучны цяжар на міжпланетных касм. караблях і арбітальных станцыях, які можа быць атрыманы шляхам вярчэння КЛА ці яго заселеных частак. Забеспячэнне палёту КЛА патрабуе шырокай сеткі наземных службаў кіравання. На ўсёй тэрыторыі Зямлі размешчаны пункты касм. сувязі, а там, дзе гэта немагчыма, у акіяне, знаходзяцца спецыяльна абсталяваныя караблі (напр., карабель «Касманаўт Уладзімір Камароў»). Караблі і наземныя пункты размешчаны так, каб па магчымасці ажыццяўляць бесперапынную сувязь з КЛА. Пункты сувязі абсталяваны вялікімі рухомымі антэнамі, прыёмнапередавальнымі станцыямі, апаратурай для запісу і дэшыфроўкі тэлеметрычных дадзеных і г. д. Усе пункты звязаны між сабою, і таму на пункце кіравання палётам заўсёды ёсць інфармацыя пра стан бартавых сістэм, работу экіпажа і інш. Пры пасадцы КЛА на Зямлю ўключаецца ў работу служба ратавання і эвакуацыі, у задачу якой уваходзіць адшукаць спускальны апарат і эвакуіраваць яго, а пры пілотных палётах — эвакуацыя экіпажа, у выпадку неабходнасці — мед. дапамога, каранцінныя мерапрыемствы (пры вяртанні экіпажа з нябесных цел аў) і г. д.

Задачы асваення касм. прасторы для патрэб чалавецтва падзяляюцца на 2 групы: навук. даследаванні і практ. выкарыстанне. К. дае неабмежаваныя магчымасці для развіцця прыродазнаўчых і тэхн. навук, мастацтва, культуры. З дапамогай ШСЗ рэтрансліруюцца тэлевіз. праграмы (гл. *Касмічнае тэлебачанне*), ажыццяўляецца тэлеф. і тэлегр. сувязь (гл. *Касмічная сувязь*). У метэаралогіі ШСЗ выкарыстоўваюцца для атрымання картаў разме ркавання воблачнасці, цеплавога выпрамянення Зямлі, назірання за рухам цыклонаў і г. д. Гэтая інфармацыя бесперапынна перадаецца ў метэарал. цэнтры свету, ёю карыстаюцца пры складанні прагнозаў надвор'я. У марской і авіяц. навігацыі для вызначэння ўласных каардынат караблёў і самалётаў ужываюцца ШСЗ, арбіты якіх вызначаюцца з вялікай дакладнасцю. Пашыраецца выкарыстанне ШСЗ для разведкі прыродных рэсурсаў Зямлі і бесперапыннага назірання за іх становішчам. Фотаздымка паверхні Зямлі праз розныя святлофільтры і інш. метады даследавання даюць магчымасць атрымліваць інфармацыю пра размеркаванне расліннасці, рух снегавога покрыва, разліў рэк, стан пасеваў і лясоў, ацэньваць ураджайнасць, рэгістраваць лясныя пажары і г. д. З спадарожнікаў вядуцца акіяналагічныя і гідралагічныя даследаванні. Асабліва каштоўнае выкарыстанне спадарожнікаў у геадэзіі і тапаграфіі — для дакладнай узаемнай прывязкі далёка размешчаных пунктаў і хуткага абнаўлення тапаграф. картаў. Спецыфічныя асаблівасці касм. палёту (бязважкасць, вакуум і інш.) могуць быць выкарыстаны для правядзення асабліва дакладных тэхнал. працэсаў; пры гэтым на ШСЗ будуць размяшчацца прамысл. ўстаноўкі, а транспартныя КЛА будуць забяспечваць іх сыравінай і дастаўляць на Зямлю гатовыя вырабы. Каб вырашыць задачы, што стаяць перад К., патрэбна значная колькасць спецыялізаваных аўтам. ШСЗ (астрадынамічныя, сонечныя, геафізічныя, метэаралагічныя, сувязныя і інш.), а таксама пілотныя доўгачасовыя шматмэтавыя станцыі. Змена экіпажа па меры неабходнасці будзе ажыццяўляцца транспартнымі касм. караблямі. Мэта К. пры вывучэнні Месяца і планет — атрыманне новых навук. дадзеных (непасрэднае выкарыстанне вынікаў такіх палётаў для патрэб нар. гасп. не прадугледжваецца). У 70-я г. 20 ст. плануецца працяг вывучэння Месяца аўтам. і пілотнымі КЛА, потым арганізацыя на ім навук. баз. Палёты да Венеры і Марса будуць ажыццяўляцца аўтаматамі, а ў 80—90-я г. задуманы пілотныя палёты з высадкай чалавека на Марсе (час экспедыцыі каля 3 гадоў).

К. з'яўляецца агульначалавечай дзейнасцю і, нават, калі праводзіцца ў нац. рамках, закранае інтарэсы многіх краін. Гэта вядзе да неабходнасці ўзгодненых дзеянняў, што знаходзіць адлюстраванне ў міжнар. супрацоўніцтве і ў распрацоўцы *касмічнага права*. Міжнар. супрацоўніцтва адбываецца шляхам абмену навук. і тэхн. інфармацыяй на кангрэсах міжнар. арганізацый, касм. эксперыментаў групамі краін, запускам ракет і спадарожнікаў садружнасцю сацыяліст. краін — праграма «Інтэркосмас», сумеснымі касм. экспедыцыямі СССР і Францыі, запускам англ., канадскіх і інш. спадарожнікаў з касмадромаў ЗША і г. д., а таксама шляхам стварэння на міжнар. аснове сістэм метэаралагічных ШСЗ, спадарожнікаў сувязі і інш. Існуе шэраг міжнар. дагавораў, рэзалюцый Генеральнай Асамблеі ААН і інш. па пытаннях дзейнасці дзяржаў у касм. прасторы і на нябесных целах. Гал. палажэнні, якія кладуцца ў аснову міжнар. супрацоўніцтва, зводзяцца да патрабаванняў свабоды даследавання і выкарыстання касм. прасторы і нябесных целаў, дэмілітарызацыі, забароны прысваення, папярэджання патэнцыяльна шкодных вынікаў эксперыментаў, дапамогі пацярпелым няшчасце экіпажам касм. караблёў. Іл. гл. на ўкл.

Штучны спадарожнік «Інтэркосмас-4» з ракетай-носьбітам у мантажна-выпрабавальным корпусе (на спадарожніку ўстаноўлены прылады, распрацаваныя вучонымі СССР, ГДР і ЧССР).



Асноўныя падзеі касмічнай эры
(храналагічны пералік)

4.10.1957 — першы ШСЗ «Спадарожнік» (СССР). 3.11.1957 — біял. ШСЗ «Спадарожнік-II» з сабакам Лайкай на борце (СССР). 1.2.1958 — першы амер. ШСЗ «Эксплорэр» (ЗША). 15.5.1958 — геафіз. лабараторыя — ШСЗ «Спадарожнік-III» (СССР). 2.1.1959 — пралёт Месяца АМС «Месяц-1» і першы штучны спадарожнік Сонца (СССР). 3.3.1959 — першы амер. штучны спадарожнік Сонца «Піянер-4» (ЗША). 12.9.1959 — дасягненне паверхні Месяца АМС «Месяц-2» (СССР). 4.10.1959 — аблёт Месяца, фатаграфаванне яго з адваротнага боку і перадача адлюстравання на Зямлю АМС «Месяц-3» (СССР). 4.4.1960 — метэарал. ШСЗ «Тырас» (ЗША). 13.4.1960 — навігацыйны ШСЗ «Транзіт» (ЗША). 10.8.1960 — вяртанне на Зямлю карыснай нагрузкі ШСЗ «Дыскаверэр-13» (ЗША). 12.2.1961 — пралёт Венеры АМС «Венера-1» (СССР). 12.4.1961 — першы палёт вакол Зямлі касманаўта Ю. А. Гагарына на караблі-спадарожніку «Усход» (СССР). 5.5.1961 — першы субарбітальны 15-мінутны палёт касманаўта А. Шэпарда на караблі «Меркурый» (ЗША). 6.8.1961 — сутачны палёт вакол Зямлі касманаўта Г. С. Шонііна на караблі «Усход-2» (СССР). 20.2.1962 — першы амер. арбітальны палёт касманаўта Дж. Глена на караблі «Меркурый» МА-6 (ЗША). 7.3.1962 — першы ШСЗ для даследавання Сонца серыі OSO (ЗША). 16.3.1962 — першы ШСЗ «Космас» (СССР). 23.4.1962 — фатаграфаванне і дасягненне паверхні Месяца першай амер. АМС «Рэйнджэр» (ЗША). 11 і 12.8.1962 — першы групавы палёт касманаўтаў А. Р. Нікалаева на караблі «Усход-3» і П. Р. Паповіча — «Усход-4» (СССР). 27.8.1962 — пралёт Венеры і яе даследаванне першай амер. АМС «Марынер». 31.10.1962 — геадэзічны ШСЗ «Анна»-1В (ЗША). 1.11.1962 — пралёт Марса АМС «Марс-1» (СССР). 14 і 16.6.1963 — групавы палёт вакол Зямлі касманаўта В. Ф. Быкоўскага на караблі «Усход-5» і першай жанчыны-касманаўта В. У. Церашковай на караблі «Усход-6» (СССР). 26.7.1963 — вывад на сінхронную арбіту сувязнога ШСЗ «Сінкам-2» (ЗША). 1.11.1963 — першы манеўравальны аўтам. ШСЗ «Палёт» (СССР). 12.10.1964 — палёт вакол Зямлі касманаўтаў У. М. Камарова, К. П. Феактыстава і Б. Б. Ягорава на трохмесным караблі «Узыход» (СССР). 18.3.1965 — выхад касманаўта А. А. Лявонава ў адкрыты космас з карабля «Узыход-2», які пілатаваў касманаўт П. І. Бяляеў (СССР). 23.3.1965 — першы манеўр на арбіце карабля «Джэмінай-3» з ручным кіраваннем, які пілатавалі касманаўты В. Грысам і Дж. Янг (ЗША). 22.4.1965 — першы сувязны ШСЗ на сінхроннай арбіце «Маланка-1» (СССР). 16.7.1965 — першы аўтам. ядзерны н.-д. ШСЗ «Пратон» (СССР). 18.7.1965 — першае фатаграфаванне адваротнага боку Месяца і перадача адлюстравання на Зямлю АМС «Зонд-3» (СССР). 16.11.1965 — дасягненне паверхні Венеры АМС «Венера-3» (СССР). 26.11.1965 — першы франц. ШСЗ «Астэрыкс-1» (Францыя). 4 і 15.12.1965 — групавы палёт з цесным збліжэннем караблёў-спадарожнікаў «Джэмінай-7» і «Джэмінай-6», якія пілатавалі касманаўты Ф. Борман, Дж. Ловел і У. Шыра, Т. Стафард адпаведна (ЗША). 31.1.1966 — першая мяккая пасадка на Месяц АМС «Месяц-9» і перадача на Зямлю фотапанарамы Месяца (СССР). 16.3.1966 — ручная стыкоўка карабля «Джэмінай-8», які пілатавалі касманаўты Н. Армстранг і Д. Скот, з ракетай «Аджэна» (ЗША). 31.3.1966 — першы штучны спадарожнік Месяца АМС «Месяц-10» (СССР). 30.5.1966 — мяккая пасадка на Месяц першай амер. АМС «Сервеер» (ЗША). 10.8.1966 — вывад на арбіту штучнага спадарожніка Месяца першай амер. АМС «Лунар Орбітэр» (ЗША). 22.4.1967 — першы палёт цяжкага карабля «Саюз», які пілатаваў касманаўт У. М. Камароў (СССР). 12.6.1967 — спуск і правядзенне даследаванняў у атмасферы Венеры АМС «Венера-4» (СССР). 14.6.1967 — пралёт Марса і яго даследаванне АМС «Марынер-5» (ЗША). 15.9 і 10.11.1968 — аблёт Месяца і вяртанне на Зямлю АМС «Зонд-5» і «Зонд-6» з выкарыстаннем балістычнага і кіроўнага спуску (СССР). 26.10.1968 — палёт вакол Зямлі касманаўта Г. П. Берагавога на караблі «Саюз-3», збліжэнне з беспілотным караблём «Саюз-2» (СССР). 7.12.1968 — першы астранамічны ШСЗ серыі ОАО (ЗША). 18.12.1968 — стацыянарны сувязны ШСЗ «Інтэлсат-3» (ЗША). 21.12.1968 — аблёт Месяца і вяртанне на Зямлю карабля «Апалон-8» з экіпажам: Ф. Борман, Дж. Ловел, У. Андэрс (ЗША). 5 і 10.1.1969 — працяг непасрэднага даследавання атмасферы Венеры АМС «Венера-5» і «Венера-6» (СССР). 14 і 15.1.1969 — першая стыкоўка на арбіце пілотных караблёў «Саюз-4» і «Саюз-5» з касманаўтамі У. А. Шаталавым і Б. В. Валынавым, А. С. Елісеевым, Я. В. Хруновым адпаведна. Апошнія два касманаўты перайшлі праз космас у другі карабель (СССР). 24.2. і 27.3.1969 — працяг даследавання Марса пры палёце АМС «Марынер-6» і «Марынер-7» (ЗША). 18.5.1969 — аблёт Месяца караблём «Апалон-10» з экіпажам: Т. Стафард, Дж. Янг, Ю. Сернан, з выхадам на селенацэнтрычную арбіту, манеўраваннем на ёй і вяртаннем на Зямлю (ЗША). 16.7.1969 — першая пасадка на Месяц пілотнага карабля «Апалон-11», касманаўты Н. Армстранг і Э. Олдрын былі на Месяцы ў Моры Спакою 21 *гадз* 36 *мін*. М. Колінз знаходзіўся ў камандным адсеку карабля на селенацэнтрычнай арбіце. Выканаўшы праграму палёту, касманаўты вярнуліся на Зямлю (ЗША). 8.8.1969 — аблёт Месяца і вяртанне на Зямлю АМС «Зонд-7» з выкарыстаннем кіроўнага спуску (СССР). 11, 12 і 13.10.1969 — групавы палёт з манеўраваннем караблёў «Саюз-6», «Саюз-7» і «Саюз-8» з экіпажамі адпаведна: Г. С. Шонін, В. М. Кубасаў; А. В. Філіпчанка, У. М. Волкаў, В. В. Гарбатко; У. А. Шаталаў, А. С. Елісееў (СССР). 14.10.1969 — першы п.-д. ШСЗ «Інтэркосмас» з навук. апаратурай сацыяліст. краін (СССР). 14.11.1969 — пасадка на Месяцы ў Акіяне Бур пілотнага карабля «Апалон-12». Касманаўты Ч. Конрад і А. Бін прабылі на Месяцы 31 *гадз* 31 *мін*. Р. Гордан знаходзіўся на селенацэнтрычнай арбіце (ЗША). 11.2.1970 — першы японскі ШСЗ «Осумі» (Японія). 11.4.1970 — аблёт Месяца з вяртаннем на Зямлю карабля «Апалон-13» з касманаўтамі Дж. Ловелам, Дж. Суіджэртам, Ф. Хейсам. Запланаваная пасадка на Месяц не адбылася ў сувязі з аварыяй на караблі (ЗША). 24.4.1970 — першы кітайскі ШСЗ (КНР). 1.6.1970 — першы самы доўгі палёт (424 *гадз*) карабля «Саюз-9» з касманаўтамі А. Р. Нікалаевым і В. І. Севасцьянавым (СССР). 17.8.1970 — мяккая пасадка на паверхню Венеры АМС «Венера-7» з навук. апаратурай (СССР). 12.9.1970 — АМС «Месяц-16» выканала мяккую пасадку на Месяц у Мора Дастатку, зрабіла свідраванне грунту, забрала ўзоры месячнай пароды і даставіла іх на Зямлю (СССР). 20.10.1970 — аблёт Месяца з вяртаннем на Зямлю з боку паўн. паўшар'я АМС «Зонд-8» (СССР). 10.11.1970 — АМС «Месяц-17» даставіла на Месяц радыёкіроўны з Зямлі самарухальны апарат «Месяцаход-1» з навук. апаратурай (СССР). 31.1.1971 — пасадка на Месяц у р-не кратэра Фра Маура пілотнага карабля «Апалон-14». Касманаўты А. Шэпард і Э. Мітчэл прабылі на Месяцы 33 *гадз*. Э. Руз знаходзіўся на селенацэнтрычнай арбіце (ЗША). 19.4.1971 — першая ў свеце пілотная арбітальная навук. станцыя «Салют» (СССР). 23.4.1971 — палёт «Саюза-10» з экіпажам: У. А. Шаталаў, А. С. Елісееў і М. М. Рукавішнікаў; стыкоўка з арбітальнай станцыяй «Салют» (СССР). 19.5.1971 — АМС «Марс-2», даставіла на паверхню Марса вымпела з выявай Герба Сав. Саюза (СССР). 28.5.1971 — АМС «Марс-3», мяккая пасадка спускальнага апарата станцыі на Марс (СССР). 6.6.1971 — дастаўка на транспартным касм. караблі «Саюз-11» экіпажа на арбітальную станцыю «Салют»; стыкоўка і пераход касманаўтаў Г. Ц. Дабралюбовскага, У. М. Волкава і В. І. Пацаева ў рабочыя адсекі станцыі. За 23 дні (7 — 29.6.1971) знаходжання на станцыі касманаўты выканалі вялікую праграму навук. даследаванняў (СССР). 26.7.1971 — пасадка на Месяц пілотнага карабля «Апалон-15». Касманаўты Д. Скот і Дж. Ірвін прабылі на Месяцы 76 *гадз* 54 *мін*. А. Уордэн знаходзіўся на селенацэнтрычнай арбіце (ЗША). 2.9.1971 — АМС «Месяц-18» (СССР). 28.9.1971 — АМС «Месяц-19», запушчана ў арбіты ШСЗ для правядзення даследаванняў Месяца з арбіты штучнага спадарожніка Месяца (СССР). 27.12.1971 — ШСЗ «Араол», запушчаны ў адпаведнасці з праграмай супрацоўніцтва паміж СССР і Францыяй (СССР).

Літ.: Циолковский К. Э. Собр. соч., т. 1—4, М., 1951—64; Космонавтика, 2 изд., М., 1970 (Маленькая энциклопедия); Справочник по космонавтике, М., 1966; Инженерный справочник по космической технике, М., 1969; Алемасов В. Е., Дрегалин А. Ф. и Тишин А. П. Теория ракетных двигателей, 2 изд., М., 1969; Петрович Г. В. Ракетные двигатели ГДЛ — ОКБ. 1929—1969, М., 1969; Левантовский В. И. Механика космического полета в элементарном изложении, М., 1970; Космические траекторные измерения, М., 1969; Космическая техника, под ред. Г. Сейферта, пер. с англ., М., 1964; Спутники связи, пер. с англ., М., 1966. *В. П. Глушко, Б. В. Райшэнбах.*

КАСМАПАЛІТЫЗМ (ад *космас*+politeia дзяржава), адмаўленне ад дасягненняў і асаблівасцей нацыянальнага ў культуры пад сцягам «адзінства чалавечага роду». На справе маскіруе агрэс. бурж. нацыяналізм, апраўдвае імкненні імперыял. дзяржаў да сусв. панавання. Марксісцка-ленінская ідэалогія адкідае К. і проціпастаўляе яму пралетарскі інтэрнацыяналізм.

КАСМА́ТАЯ БРО́НЗАЎКА, жук сям. пласцініставусых. Гл. *Алёнка*.

КАСМАЧО́Ў Канстанцін Міхайлавіч [н. 24.4 (7.5).1911, в. Мікуліна Аршанскага пав. Магілёўскай губ.], беларускі савецкі жывапісец



К. М. Касмачоў. На калгасным пчальніку. 1950. Дзярж. маст. музей БССР.

і графік. Засл. дз. маст. БССР (1963). У 1932 скончыў Віцебскі маст. тэхнікум. Вучыўся ў В. Руцая, М. Эндэ. Удзельнік Вял. Айч. вайны. У 1948—57 выкладчык Мінскага маст. вучылішча. Працуе ў гістар. жанры і пейзажы. Майстар сюжэтна-тэматычнай кампазіцыі. Першая значная работа — «У падпольнай друкарні» (1940). Асн. тэма творчасці — вобраз У. І. Леніна (карціны «Ленін у Разліве», 1947; «Напярэдадні», 1958, алей; варыянт, створаны тэмперай, 1961; трыптых «Незабыўнае», 1961—62; «Зара», 1962). Творы на тэмы сучаснасці вызначаюцца святочнай прыўзнятасцю, лірычным настроем («Калгасны статак», 1948; «На калгасным пчальніку», 1950; трыптых «Рэчыцкая лірычная», 1962—65). Шэраг пейзажаў прысвечаны вобразам стараж. архітэктуры Беларусі і Расіі («Дождж прайшоў», 1964; «Залатая пара», 1966; «Нясвіж. Замак», 1966—67; «Мірскі замак», 1967; «Мікуліна», 1967; «Масква. Крэмль. Архангельскі сабор», 1968; «Лагойск. Ускраіна. Сакавік», 1969; і інш.). Сярод графічных работ малюнкі вугалем («Напярэдадні», 1957; «Рыбалоўныя снасці», 1961; «Красавік. Хмурны дзень», 1961). У Дзярж. маст. музеі БССР 29 работ мастака. Іл. гл. таксама на ўкл. IV да арт. *Жывапіс* і на ўкл. II да арт. *Лініяліза*.

Літ.: Ганчароў М. І. Касмачоў Канстанцін Міхайлавіч. Мн., 1970. *С. І. Кітаніна.* Мінск.

КАСМАЧЭЎСКАЕ, возера ў бас. р. Бобр, левага прытока Бярэзіны, у Талачынскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 0,54 км². Даўж. 1,3 км, найб. шыр. 0,5 км, сярэдняя 0,4 км. Залягае сярод балотаў, катлавіна выцягнута з Пн на Пд. Схілы спадзістыя, укрытыя лесам і хмызняком. Вадазбор хваліісты. Возера сцёкавае: выцякае р. Еленка, упадае Бобр. Водзяцца плотка, лешч, шчупак, акунь, джгір.

КАСМАЧЭЎСКІ Вячаслаў Віктаравіч [н. 3(15).2.1887, Ташкент], савецкі вучоны ў галіне інфекцыйных хвароб. Д-р мед. н. (1941), праф. (1938). Чл. КПСС з 1945. У 1914 скончыў мед. ф-т Юр'еўскага ун-та. Заг. кафедры інфекц. хвароб Мінскага мед. ін-та (1934—50), Бел. ін-та ўдасканалення ўрачоў (1945—55), Ленінградскага сан.-гігіен. ін-та (1955—66). Асн. працы па патагенезе, клініцы, дыягностыцы, прафілактыцы інфекц. хвароб, праблемах алергіі. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.

Тв.: К вопросу о клинических проявлениях сосудистых поражений при дифтерии, «Клиническая медицина», 1949, № 12; Прырода інфекцыйных хвароб і мерапрыемствы па барацьбе з імі, Мн., 1952.

КАСМЕ́ТЫКА (грэч. kosmētikē майстэрства ўпрыгожваць), галіна медыцыны, якая распрацоўвае сродкі і мерапрыемствы падтрымання здаровага стану скуры, валасоў і пазногцяў чалавека, ліквідацыі іх хібаў і паляпшэння вонкавага выгляду. Адрозніваюць К. ўрачэбную (кансерватыўную і хірургічную) і дэкаратыўную.

Урачэбную кансерватыўную К. падзяляюць на прафілакт. (гігіенічную) і лячэбную. Прызначэнне прафілактычнай — барацьба з праявамі старэння арганізма (вяласць скуры, маршчыны). Выкарыстоўвае касмет. сродкі (ваду, мыла, крэмы, ласьёны). Прызначэнне кансерватыўнай лячэбнай К.— зніжчаць вугры, хлаазмы, лячыць ад выпадзення валасоў, празмернага іх росту і тлустасці, ачышчаць скуру твару. Ужывае фізіятэрапеўтычныя сродкі, вітамінныя і адбельвальныя маскі, масаж і інш. Хірург. К. аперацыйна выпраўляе набытыя або прыроджаныя дэфекты скуры, форму носа, вушэй, узроставыя заганы. Дэкаратыўная К. маскіруе недахопы скуры, валасоў, вейкаў, броваў з выкарыстаннем пудры, румянаў, крэмаў, фарбаў.

Літ.: Аствацатуров К. Р. и Кольгуненко И. И. Косметика для всех, М., 1965; Картамышев А. И. и Арнольд В. А. Косметический уход за кожей, 3 изд., Киев, 1967.

А. Дз. Паповіч. Мінск.

КАСМІНСКІ Яўген Аляксеевіч [21.10(2.11). 1886, Варшава — 24.7.1959], савецкі гісторык-медыявіст. Акад. АН СССР (1946; чл.-кар. 1939), засл. дзеяч навукі РСФСР (1947). Скончыў Маскоўскі ун-т (1910), выкладаў у ім. Аўтар даследаванняў агр. гісторыі сярэдневяковай Англіі. Насуперак бурж. вотчыннай тэорыі разглядаў феад. вотчыну (англ. манар) як інстытут для прысваення феадаламі зямельнай рэнты. Даказаў наяўнасць вострай класавай барацьбы ў англ. вёсцы. Расслаенне сялянства разглядаў як вынік развіцця таварна-грашовых адносін. Дзярж. прэмія СССР 1942.

Тв.: Английская деревня в XIII в., М.—Л., 1935; Исследования по аграрной истории Англии XIII в., М.—Л., 1947; Историография средних веков. V в.— середина XIX в. Лекции, М., 1963; Проблемы английского феодализма и историографии средних веков. Сб. ст., М., 1963 (бібліягр. прац К.).

КАСМІЧНАЕ ПРАВА, галіна міжнар. права, якая рэгулюе ўзаемаадносіны паміж дзяржавамі і міжнар. арганізацыямі, што ўзнікаюць у працэсе іх дзейнасці ў космасе. Вызначае прававы рэжым касм. прасторы і нябесных целаў.

СССР першы пачаў асвойваць космас і 15.3.1958 выступіў з прапановамі забараніць выкарыстанне космасу ў ваен. мэтах, стварыць орган ААН па супрацоўніцтве ў яго вывучэнні і ўстанавіць міжнар. кантроль за выкананнем прынятых абавязацельстваў. У снеж. 1959 на XII сесіі Ген. Асамблеі ААН створаны Камітэт 24 дзяржаў для вывучэння практ. мерапрыемстваў міжнар. супрацоўніцтва ў асваенні космасу, арганізацыі ўзаемнага абмену і пашырэнні звестак па яго даследаванні. 5.8.1963 па ініцыятыве СССР заключаны дагавор аб забароне выпрабаванняў ядз. зброі ў атмасферы, космасе і пад вадою. Дасягнута дамоўленасць паміж СССР і ЗША не размяшчаць у космасе аб'ектаў з ядз. зброяй і інш. відамі зброі масавага знішчэння, што замацавана рэзалюцыяй Ген. Асамблеі ААН ад 17.10.1963. У 1967 заключаны дагавор аб прынцыпах дзейнасці дзяржаў па даследаванні і выкарыстанні касм. прасторы, уключаючы Месяц і інш. нябесныя целы, 22.4.1968 заключана пагадненне аб ратаванні касманаўтаў, вяртанні касманаўтаў і аб'ектаў, запушчаных у космас.

Касм. прастора і нябесныя целы адкрыты для даследавання і выкарыстання ўсім дзяржавам, але яны не павінны пашыраць на іх свой суверэнітэт або захопліваць іх. У Сав. Саюзе ў 1959 створана Камісія АН СССР па прававых пытаннях міжпланетнай прасторы — навук.-арганіз. цэнтр СССР па вывуч. і распрацоўцы прававых пытанняў космасу.

Літ.: Жуков Г. П. Космическое право, М., 1966; Оспицкая Г. А. Освоение космоса и международное право, М., 1962; Жуков Г. П., Василевская Э. Г. и Лукин П. И. Правовые аспекты использования искусственных спутников для целей метеорологии и радиосвязи, М., 1970.

М. М. Авакаў. Мінск.

КАСМІЧНАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ (касмабачанне), непасрэдная перадача і прыём па сеткі тэлевізійнага вяшчання адлюстраванняў з борта касмічнага апарата, які знаходзіцца ў касмічнай прасторы ці на паверхні іншай планеты. Сігналы, пасланыя бартавой апаратурай касм. станцыі, прымаюцца наземнай станцыяй радыёсувязі і перадаюцца на тэлецэнтр, адкуль рэтрансліруюцца па сетках тэлебачання СССР, Інтэрбачання і Еўрабачання. Касм. тэлевіз. апаратура надзейна працуе ў шырокім дыяпазоне т-р, у глыбокім касм. вакууме і вытрымлівае вял. мех. перагрузкі. У жн. 1961 упершыню з космасу на Зямлю перадавалася адлюстраванне лётчыка-касманаўта СССР Г. С. Цітова з касм. карабля «Усход-2». Групавы палёт лётчыкаў-касманаўтаў А. Р. Нікалаева і П. Р. Паповіча ў жн. 1962 даў пачатак сав. К. т., якое трывала ўвайшло ў практыку касм. палётаў. 18.3.1965 па К. т. перадаваўся першы ў гісторыі чалавецтва выхад сав. касманаўта А. А. Лявонава ў адкрытую касм. прастору. У ліп. 1969 пры палёце амер. касм. карабля «Апалон-11» і ў час знаходжання касманаўтаў Н. Армстранга і Э. Олдрына на Месяцы вялася тэлевізійная перадача на Зямлю. Сав. *«Месяцаход-1»* меў пекалькі панарамных тэлевіз. камер, якія перадавалі на Зямлю тапаграфічную здымку мясцовасці, навігацыйныя вымярэнні, вынікі даследавання месячнай паверхні і інш.

Літ.: Брацлавец П. Ф., Росселевич И. А. и Хромов Л. И. Космическое телевидение, М., 1967; Сиверс А. П. Основы космической радиоэлектроники, М., 1969.

Адлюстраванне, атрыманае па тэлебачанні з космасу. Савецкія лётчыкі-касманаўты А. Р. Нікалаеў (справа) і В. І. Севасцьянаў на касмічным караблі «Саюз-9».



КАСМІЧНАЯ БІЯЛО́ГІЯ, галіна біялогіі, якая вывучае дзеянне фактараў, што ўплываюць на жывыя арганізмы ў адкрытай касмічнай прасторы і ў палёце на касмічных лятальных апаратах, а таксама формы і ўмовы жыцця на інш. планетах. Цесна звязана з астрабіялогіяй. Развіццё К. б. абумоўлена дасягненнямі сав. вучоных, якія ўпершыню запусцілі ў космас караблі з жывымі аб'ектамі. Гэта дало магчымасць біёлагам, медыкам і касманаўтам, выкарыстоўваючы новыя дасягненні авіяц. біялогіі і касм. медыцыны, радыебіялогіі, фізікі, радыёэлектронікі і інш. навук, упершыню паставіць пытанне аб вывучэнні непасрэднага ўплыву касм. палёту на жывыя арганізмы (знаходжанне ў адкрытым космасе, перагрузкі, вібрацыі, бязважкасць, касм. радыяцыя, асаблівасці жыццядзейнасці ў замкнёнай прасторы — харчаванне, рытм жыцця, мікраклімат і інш.), абгрунтаваць рэкамендацыі для забеспячэння нармальнай жыццядзейнасці ў касм. прасторы.

Першым этапам біял. даследаванняў ва ўмовах, блізкіх да касм. палёту, былі палёты сабак і малпаў у ракетах. Даследаванні па К. б. далі магчымасць распрацаваць шэраг ахоўных мерапрыемстваў і падрыхтаваць умовы бяспечнага палёту ў космас чалавека. Важная роля належыць К. б. і ў распрацоўцы неабходных для далёкіх палётаў замкнёных экалагічных сістэм з аўтатрофнымі і гетэратрофнымі арганізмамі. Па пытаннях К. б. ў СССР выдаецца час. «Космическая биология и медицина».

Літ.: Проблемы космической биологии, т. 1—11, 13, 16, М., 1962—71; Успехи СССР в исследовании космического пространства (1957—1967), М., 1968; Космонавтика, М., 1968; Газенко О. Г. Некоторые проблемы космической биологии, «Вестник АН СССР», 1962, № 1; гл. таксама літ. пры арт. *Касмічная медыцына.* *А. С. Дзмітрыеў.* Мінск.

КАСМІЧНАЯ ГЕАДЭЗІЯ (спадарожнікавая геадэзія), раздзел *геадэзіі*, у якім вывучаюцца метады вызначэння памераў і формы Зямлі, становішчаў апорных пунктаў на зямной паверхні з дапамогай назіранняў натуральнага (Месяц) і штучных спадарожнікаў Зямлі (ШСЗ). Пачала развівацца ў 20 ст. У аснову яе метаду пакладзена вызначэнне каардынат спадарожнікаў Зямлі. Вызначаючы каардынаты спадарожнікаў з наземных станцый, каардынаты якіх вядомыя, і са станцый з невядомымі каардынатамі, можна вызначыць каардынаты апошніх. Гэты метад дае магчымасць пабудаваць апорныя сеткі прасторавай *трыянгуляцыі*, якія будуць звязваць розныя кантыненты, астравы і любыя аддаленыя пункты на зямной паверхні ў адзінай сістэме каардынат, г. зн.

стварыць адзіную геад. сетку на Зямлі. Шляхам назіранняў за рухам блізкіх спадарожнікаў Зямлі па адхіленнях іх арбіт ад нармальных вызначаецца сціснутасць Зямлі і ўдакладняюцца параметры яе гравітацыйнага поля, атрымліваюцца звесткі пра размеркаванне цяжкіх і лёгкіх мас унутры Зямлі.

Метады выкарыстання Месяца для рашэння задач вышэйшай геадэзіі (назіранні пакрыццяў зорак Месяцам, сонечных зацьменняў, фатаграфаванне Месяца на зорным фоне) забяспечваюць далёкасць дзеяння, але даюць невысокую дакладнасць і вельмі складаныя. З запускам у СССР (1957) першага ШСЗ К. г. атрымала новыя сродкі для вывучэння Зямлі. Запускаюцца спец. геадэзічныя ШСЗ, якія служаць для прывязкі (вызначэння дакладных каардынат) асобных пунктаў на паверхні Зямлі шляхам дакладных радыётэхн. ці аптычных вымярэнняў становішча ШСЗ з некалькіх наземных вымяральных пунктаў. Такія ШСЗ маюць хранометры і прылады падачы серый светлавых успышак (актыўныя ШСЗ), радыёперадатчыкі, лазерныя адбівальнікі (пасіўныя ШСЗ) і інш. прылады. ШСЗ выкарыстоўваюць таксама для аэрафотаздымкі з вялікіх вышынь, для картаграфавання Зямлі, Месяца, планет.

Літ.: Бурша М. Основы космической геодезии, ч. 1, пер. с чеш., М., 1971; Вейс Г. Геодезическое использование искусственных спутников Земли, пер. с англ., М., 1967; Каула У. Спутниковая геодезия, пер. с англ., М., 1970.

І. І. Купчынаў. Гомель.

КАСМІЧНАЯ МЕДЫЦЫНА, раздзел медыцыны, які вывучае медыка-біялагічныя аспекты касмічных палётаў. Цесна звязана з *авіяцыйнай медыцынай* і *касмічнай біялогіяй*. Выкарыстоўвае звесткі біялогіі, фізікі, біяфізікі, фізіялогіі, хіміі, дасягненні радыёэлектронікі і інш. галін тэхнікі.

Узнікла К. м. ў сярэдзіне 20 ст. з развіццём *касманаўтыкі*. Тэарэт. і навук. асновы яе звязаны з ідэямі К. Э. Цыялкоўскага, уключаюць шэраг дасягненняў авіяц. медыцыны і эксперым. фізіялогіі па вывучэнні дзеяння экстрэмальных фактараў на жывыя арганізмы. Для развіцця К. м. шмат зрабілі савецкія вучоныя В. В. Парын, Н. М. Сісакян, А. Г. Газенка і інш. К. м. даследуе ўплыў на арганізм фактараў касмічнага палёту (перагрузак, бязважкасці, вібрацыі, касм. прамянёў, нязвычных т-р і атм. ціску, доўгай маларухомасці і ізаляцыі ў касм. караблі, дзейнасці са сродкамі аўтаномнага жыццезабеспячэння), мяжу пераадолення фізіял. напружанняў, працэсы прыстасавання да іх. Распрацоўвае мед. крытэрыі па канструяванні сістэм жыццезабеспячэння, сродкаў прафілактыкі і аховы касманаўтаў, рацыянальнай будовы сістэмы кіравання касм. лятальным апаратам, па адборы і падрыхтоўцы касманаўтаў, па забеспячэнні спец. кантролю за станам іх здароўя, абгрунтаванні рэжыму харчавання, працы і адпачынку. Вырашае праблемы метадамі лабараторнага эксперымента на Зямлі з дапамогай спец. стэндаў і установак (баракамер, ядз. паскаральнікаў, цэнтрыфугаў і інш.) і ў час касм. палёту з дапамогай радыётэлеметрыі і сродкаў урачэбнага кантролю. У Ін-це фізіялогіі АН БССР вывучаюць лабірынтныя і экстралабірынтныя нейра-гумаральныя механізмы кампенсаторных рэакцый арганізма на ўплыў гіпергравітацыі, іх фарміраванне ў антагенезе і радыяцыйна-біяхім. зрухі ад малых доз радыяцыі. Час. па пытаннях К. м. «Космическая биология и медицина» (СССР), «Aerospace Medicine» («Касмічная медыцына», ЗША) і інш.

Літ.: Медико-биологические исследования в невесомости, М., 1968; Краткий справочник по космической биологии и медицине, М., 1967; Первые космические полёты человека, под ред. Н. М. Сисакяна и В. И. Яздовского, М., 1962.

А. С. Дзмітрыеў. Мінск.

КАСМІЧНАЯ СКОРАСЦЬ, скорасць, якую трэба надаць касмічнаму апарату, каб выканаць палёт па зададзенай траекторыі адносна Зямлі (або інш. нябеснага цела).

Адрозніваюць тры К. с.: першую, другую і трэцюю. Першая К. с.— мінімальная скорасць, якую павінна набыць цела, каб стаць штучным спадарожнікам Зямлі і рухацца вакол яе па кругавой арбіце. Другая К. с.— мінімальная скорасць, якую павінна набыць цела, каб пераадолець прыцягненне Зямлі і паляцець у касм. прастору. Пры такой скорасці цела становіцца штучнай планетай Сонечнай сістэмы. Трэцяя К. с.— мінімальная скорасць, якую павінна набыць цела на паверхні Зямлі, каб пераадолець прыцягненне Сонца і выйсці за межы Сонечнай сістэмы. Каля паверхні Зямлі першая, другая і трэцяя К. с. роўныя адпаведна 7,9; 11,2; 16,7 *км/сек*.

Літ.: Меркулов П. А. Космические скорости, М., 1967; Фертрегт М. Основы космической техники, пер. с англ., М., 1960.

А. І. Болсун. Мінск.

КАСМІЧНАЯ СУВЯЗЬ, сістэмы сувязі для перадачы інфармацыі, сігналаў каманд і кіравання касмічным лятальным апаратам (КЛА), правядзення траекторных вымярэнняў.

Асн. асаблівасці сістэм К. с. ў адрозненне ад наземных абумоўлены бесперапыннай (вельмі хуткай) зменай становішча КЛА, неабходнасцю ведання бягучых каардынат КЛА і навядзення прыёмных і перадавальных антэн наземнага пункта сувязі, бесперапыннай зменай частаты прымальных сігналаў, абмежаваным і пераменным ў часе зонамі ўзаемнай бачнасці наземнага пункта і КЛА, абмежаваній магутнасцю бартавых перадатчыкаў КЛА, вялікімі адлегласцямі і таму работай в вельмі малымі ўзроўнямі прымальных сігналаў. Гэтыя асаблівасці вымагаюць ствараць для К. с. спец. комплексы апаратуры: саманаводныя антэны вял. памераў; прыёмныя прыстасаванні з малым узроўнем шумаў; высокаэфектыўныя сістэмы знаходжання, вылучэння і рэгістрацыі сігналаў.

Па напрамку сувязі сістэмы К. с. падзяляюцца на тры віды: паміж наземнымі пунктамі сувязі і КЛА ці штучнымі спадарожнікамі Зямлі (ШСЗ); паміж двума ці некалькімі наземнымі пунктамі сувязі праз штучныя сродкі, якія знаходзяцца ў космасе; паміж КЛА. Сувязь Зямля — КЛА прызначаецца для двухбаковай перадачы ўсіх відаў неабходнай інфармацыі. Лінія Зямля — борт КЛА (З-Б) забяспечвае перадачу на КЛА сігналаў каманд кіравання, сігналаў траекторных вымярэнняў, пры заселеных касм. караблях (КК) — сувязь з касманаўтамі (тэлефон, тэлеграф, тэлебачанне). Лінія борт КЛА — Зямля (Б-З) забяспечвае кантроль кіравання, траекторныя вымярэнні, перадачу тэлеметрычных вымярэнняў і мэтавай інфармацыі (напр., метэаралагічнай, навігацыйнай, навуковай і інш., у залежнасці ад прызначэння КЛА), а таксама сувязь экіпажа КК з Зямлёй. Упершыню радыёсувязь з чалавекам у космасе наладжана 12.4. 1961, калі лётчык-касманаўт Ю. А. Гагарын абляцеў Зямлю на КК «Усход» і ў час усяго палёту падтрымліваў двухбаковую ўстойлівую тэлеф.-тэлегр. сувязь з Зямлёй на кароткіх і ультракароткіх хвалях. У палётах КК «Усход», «Узыход» і «Саюз» радыёсувязь з Зямлёй удасканальвалася. У жн. 1961 упершыню в космасу перадавалася адлюстраванне касманаўта Г. С. Цітова (гл. *Касмічнае тэлебачанне*). Найб. далёкасць двухбаковай радыёсувязі дасягнута пры палётах аўтам. міжпланетных станцый да Марса і Венеры. Сувязь праз ШСЗ выкарыстоўваецца для перадачы тэлевіз. праграм, шматканальнай тэлефаніі, тэлеграфіі і інш. Сувязь паміж КЛА ўстанаўліваецца для абмену інфармацыяй паміж экіпажамі двух ці некалькіх КК, паміж экіпажамі і касманаўтамі, якія знаходзяцца ў космасе, паміж аўтам. КЛА для ратрансляцыі сігналаў, вымярэння становішча, навігацыі, кіравання рухам і збліжэннем. Сістэмы К. с. ўскладняюцца пры высадцы экспедыцый на Месяц і інш. планеты, бо трэба падтрымліваць сувязь з КК, які знаходзіцца на планетацэнтрычнай арбіце, і з Зямлёю. З вынаходствам квантавых аптычных генератараў (лазераў) даволі перспектыўная аптычная сувязь: на аптычных хвалях можна перадаваць на вышматдалёкія адлегласці (да дзесяткаў светлавых гадоў) адначасова дзесяткі тысяч паведамленняў.

Літ.: Петрович Н. Т. и Камнев Е. Ф. Вопросы космической радиосвязи, М., 1965; Крэс-

снер Г. Н. и Михаелс Дж. В. Введение в системы космической связи, пер. с англ., М., 1967.

І. С. Кавалёў. Мінск.

КАСМІЧНЫ ЛЯТАЛЬНЫ АПАРАТ (КЛА), апарат для палёту ў космас ці ў космасе. КЛА могуць быць беспілотныя і пілотныя. Беспілотныя — штучныя спадарожнікі нябесных целаў, аўтам. арбітальныя і міжпланетныя станцыі; пілотныя — караблі-спадарожнікі, арбітальныя станцыі і міжпланетныя караблі. Найб. пашыраныя КЛА: штучныя спадарожнікі Зямлі для навук. даследаванняў, сувязі, навігацыі, метэаралогіі і інш.; *аўтаматычныя міжпланетныя станцыі* для блізкіх і далёкіх палётаў, у прыватнасці для мяккай пасадкі на Месяцы і даследавання яго паверхні (гл. *Аўтаматычная месячная станцыя*); арбітальныя караблі-спадарожнікі, караблі для палётаў на Месяц.

Канструкцыя і абсталяванне КЛА вызначаюцца яго прызначэннем. На пілотных прадугледжаны сістэмы жыццезабеспячэння, радыёсувязі, энергасілкавання, тэрмарэгулявання, тэлеметрыі, арыентацыі і кіравання рухам, прызямлення. На беспілотных выкарыстоўваюцца пераважна сістэмы, якія забяспечваюць цеплавы рэжым, энергасілкаванне бартавой апаратуры, радыёсувязь з Зямлёй. Акрамя таго, на борце апарата ўстанаўліваюцца прылады для навук. даследаванняў, рэтрансляцыі радыёперадач і г. д. КЛА выводзіцца на арбіту *ракетай-носьбітам*. На ўчастку вываджэння апарату надаецца неабходная скорасць у зададзеным кірунку. На арбітальным участку палёту апарат рухаецца па інерцыі. Калі неабходна змена (карэкціроўка) траекторыі ці тармажэнне, на апараце ўстанаўліваюцца спец. ракетныя рухавікі. Палёт КЛА адбываецца па вызначанай праграме. Беспілотны апарат выконвае радыёкаманды з Зямлі і каманды, што падаюцца бартавымі праграмна-часавымі прыладамі. Апошнія выкарыстоўваюцца, калі няма сувязі з Зямлёй, паміж сеансамі сувязі і для спуску апарата. На пілотных КЛА, акрамя таго, прадугледжваецца ручное кіраванне, якое выконваецца экіпажам. Найб. складаны этап палёту КЛА — спуск на паверхню Зямлі і інш. планет. Спуск на нябесныя целы, дзе няма атмасферы, магчымы толькі з дапамогаю ракетнага тармажэння. Для спуску на Зямлю і інш. планеты, у якіх ёсць атмасфера, найб. мэтазгоднае тармажэнне за кошт аэрадынамічных сіл. Паспяховае ажыццяўленне касм. палётаў залежыць ад надзейнасці канструкцыі і абсталявання КЛА, а таксама іх стойкасці супраць дзеяння фактараў касмічнага палёту. Апошняе забяспечваецца выкарыстаннем матэрыялаў, стойкіх супраць аэрадынамічнага награвання, «метэорнай эрозіі», здольных затрымліваць радыяцыю і г. д. За 14 гадоў развіцця касм. тэхнікі ў СССР створаны разнастайныя тыпы КЛА — ад першага *штучнага спадарожніка Зямлі* (1957) да касм. караблёў серый *«Усход»*, *«Узыход»*, *«Саюз»*, аўтам. касм. апарата *«Месяц»*, міжпланетных станцый *«Венера»*, *«Зонд»*, *«Марс»*, арбітальнай станцыі *«Салют»*. З амер. КЛА найб. вядомыя *«Апалон»*, *«Джэмінай»*. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Касманаўтыка*.

Літ.: Циолковский К. Э. Реактивные летательные аппараты, М., 1964; Пономарев А. Н. Пилотируемые космические корабли, М., 1968; Бубнов И. Н. и Каманин Л. Н. Обитаемые космические станции, М., 1964; Автоматические разведчики космоса, М., 1967; Пахута С. А. Искусственный спутник Земли, Мн., 1957; Космонавтика, 2 изд., М., 1970 (Маленькая энциклопедия).

КАСМІЧНЫ РАКЕТНЫ РУХАВІК, гл. *Ракетны рухавік*.

КАСМІЧНЫЯ ПРАМЯНІ, патокі ядраў і *элементарных часцінак* у космасе і атмасферы. К. п. ў космасе наз. першаснымі (ПКП); прамяні, якія ўзнікаюць ад узаемадзеяння ПКП з рэчывам атмасферы, наз. другаснымі (ДКП).

У склад ПКП уваходзяць пратоны (92%), альфа-часцінкі (7%), інш. ядры і электроны (1%). Распаўсюджанасць цяжкіх ядраў у ПКП у параўнанні з працэнтным саставам элементаў у нябесных целах павялічаная. Сярэдняя энергія часцінкі ў ПКП каля 10 *Гэв*, але часам трапляюцца часцінкі значна больших энергій (да 10^{10} *Гэв*), недасягальных для сучасных паскаральнікаў зараджаных часцінак. Поўная энергія, што пераносіцца ПКП на Зямлю, невялікая і параўнальная з энергіяй бачнага святла зорак. Узаемадзеянне ПКП (большасць часцінак у якіх зараджана дадатна) з маг. полем Зямлі выклікае шэраг т. зв. геамагнітных з'яў, напр. залежнасць інтэнсіўнасці К. п. ад геамагнітнай шыраты і даўгаты. Аналіз гэтых з'яў сцвярджае ізатропны характар патокаў ПКП і нязменнасць іх інтэнсіўнасці (каля $2 \cdot 10^{-4}$ *часц/см² стэр. сек*). Паходжанне ПКП канчаткова не высветлена. Магчыма, што яны параджаюцца пры ўспышках звышновых зорак. У склад ДКП уваходзяць усе вядомыя элементарныя часцінкі. На ўзроўні мора ДКП падзяляюць на жорсткую (μ-мезоны) і мяккую (электроны, пазітроны і фатоны) кампаненты. Інтэнсіўнасць першай у 4 разы вышэйшая, чым другой. Мяккая кампанента ДКП разам з ядз. каскадам утварае шырокія атмасферныя ліўні (магутныя патокі другасных часцінак), папярочнік якіх на ўзроўні мора дасягае соцень метраў.

Літ.: Гинзбург В. Л. Космические лучи у Земли и во Вселенной, 2 изд., М., 1967.

І. С. Сацункевіч. Мінск.

КАСНІКІ, вузкія палоскі тканіны, якія ўплятаюць у косы. Называюцца таксама стужкамі, укоснікамі, уплётнікамі.

КАСОВІЧ Каятан Андрэевіч [1815, Полацк — 26.1(7.2).1883], рускі ўсходазнавец, адзін з першых санскрытолагаў Расіі. Скончыў Маскоўскі ун-т (1836). Чл. Рускага геагр. т-ва (1849), многіх замежных навук. т-ваў. З 1850 рэдактар навук. прац публічнай бібліятэкі ў Пецярбурзе, з 1860 адначасова праф. санскрыцкай мовы і л-ры Пецярбургскага ун-та. Першы ў Расіі пераклаў і выдаў шэраг стараж.-інд. драм, урыўкаў з эпасу «Махабхарата», інш. літ. помнікаў. У 1854 пачаў выдаваць «Санскрыта-рускі слоўнік» (не закончаны). Выдаў збор стараж.-перс. клінападобных надпісаў, «Грэчаска-рускі слоўнік» (з І. Касовічам, 1847).

Літ.: Березин И. Н., К. А. Коссович. (Некролог). [СПб., 1883]; Бас І. С. Эцюды пра вучоных, «Маладосць», 1971, № 8.

І. С. Бас. Мінск.

КАСОП Фядосій (г. н. і см. невяд.), рускі рэлігійны вальнадумец і прапаведнік сярэдзіны 16 ст., прадстаўнік сялянска-плебейскай *ерасі*. З халопаў. З 1551 выступаў з прапагандай радыкальна-рэфармацыйнага вучэння. У 1554 прыцягнуты да следства па справе ерэтыка М. С. Башкіна і зняволены ў адзін з маск. манастыроў, адкуль уцёк на Беларусь і пасяліўся каля Віцебска. Канец 50-х і большую частку 60-х г. жыў на Беларусі, потым перабраўся на Валынь. Распаўсюджваў сваё вучэнне, якое ўплывала на бел. радыкальна-рэфармацыйны рух. У канцы 60-х г. далучыўся да бел. антытрынітарыяў. Пра погляды і дзейнасць К. вядома пераважна з палемічных твораў З. *Атэнскага*. К. адмаўляў царк. дагматыку, абраднасць, духавенства. Хрыста лічыў звычайным чалавекам, не верыў у замагільнае жыццё і ўваскрэсенне мёртвых, выступаў супраць феад. эксплуатацыі, за роўнасць народаў і веравызнанняў, сумняваўся ў стварэнні свету богам.

Літ.: Зимин А. А., И. С. Пересветов и его современники, М., 1958; Клибанов А. И. Реформационные движения в России в XIV — первой половине XVI вв., М., 1960; Шелестов Д. К. Свободомыслие в учении Феодосия Косого, у зб.: Вопросы истории религии и атеизма, т. 2, М., 1954; Корецкий В. И. К вопросу о социальной сущности «Нового учения» Феодосия Косого, «Вестник МГУ», 1956, № 2. *С. А. Падокшын.* Мінск.

КАСПІЙСКАЕ МОРА, Каспій (назва ад стараж. племя каспіяў; у стараж. і сярэднія вякі наз. Гірканскім, у рус. летапісах — Хвалынскім або Хвалінскім м.), самае вялікае бяссцёкавае салёнае возера на Зямлі. На мяжы Еўропы і Азіі, абмывае берагі СССР і Ірана. Даўж. з Пн на Пд больш за 1200 *км*, найб. шыр. 554 *км*. Плошча мора няўстойлівая з-за вагання ўзроўню вады (у 1930 — 424 тыс. *км*², 1952 — 393 тыс. *км*², 1971 — 371 тыс. *км*²).

Размешчана на 28 *м* ніжэй узр. акіяна. Аб'ём вады 76 тыс. *км*³, сярэдняя глыб. 205 *м*. У К. м. ўпадаюць Волга (80% рачнога сцёку ў мора), Урал, Кура, Церак, Самур і інш. Распрацаваны праект перакідкі часткі сцёку паўн. рэк Еўрап. ч. ў Каспій, каб стабілізаваць узровень мора. Катлавіна К. м. па рэльефе дна падзяляецца на 3 часткі: паўн. мелкаводную (глыб. да 25 *м*), сярэднюю (да 800 *м*), паўд., самую глыбакаводную (да 1025 *м*). Найб. а-вы: Цюленевы, Чэчэнь, Арцёма, Агурчынскі, Жылой. Даўж. берагавой лініі 6380 *км*, мала парэзаная. П-вы: Апшэронскі, Мангышлак, Чэлекен. Найб. залівы: Кара-Багаз-Гол, Краснаводскі, Кізлярскі, Мангышлакскі, Казахскі. Т-ра вады зімой на Пн ніжэй за 0°, на Пд да 13 °С; летам павышаецца да 25, 26 °С. Зімой паўн. ч. мора замярзае. У асобныя гады плывучы лёд прыганяецца моцнымі вятрамі да Дэрбента, часам да Апшэронскага п-ва. Салёнасць на Пн да 1‰ (пастаянны прыток прэснай вады Волгі і Урала), на Пд да 13—14‰, у заліве Кара-Багаз-Гол 300‰. Паверхневыя цяч. ўтвараюць цыкланальны кругаварот.

Перавозка нафты, нафтапрадуктаў, сульфатаў, лесу, бавоўны. Промыслы цюленя, асятровых, сазана, ляшча, воблы, каспійскага селядца, кількі і інш. Здабыча нафты са дна мора. Найважн. марскія нафтапромыслы: Апшэронскі («Нафтавыя Камяні») і Бакінскі архіпелагі ў Азерб. ССР, каля п-ва Чэлекен у Туркм. ССР, каля Махачкалы і Ізбербаша ў Дагестане. Гал. порты: Баку, Астрахань, Гур'еў, Форт-Шаўчэнка, Краснаводск, Махачкала (СССР), Пехлеві (Іран). Паромная пераправа паміж Баку і Краснаводскам.

Літ.: Материалы Всесоюзного совещания по проблеме Каспийского моря, Баку, 1963; Каспийское море, М., 1969. *В. Р. Заўрыеў.* Мінск.

КАСПІЙСКАЯ ВАЕННАЯ ФЛАТЫЛІЯ, адна з старэйшых рускіх флатылій. Створана ў 1722. Пры Пятры I і пазней удзельнічала ў войнах з Персіяй і Турцыяй. Маракі К. в. ф. змагаліся за ўстанаўленне Сав. улады ў Азербайджане, з белагвардзейцамі і інтэрвентамі на Паўн. Каўказе і ў Закаўказзі. У Вял. Айч. вайну забяспечвала перавозкі войск і грузаў, асабліва ў час Сталінгр. бітвы і пры абароне Каўказа. У 1945 узнаг. ордэнам Чырв. Сцяга.

Літ.: Маковский А. А. и Радченко Б. М. Каспийская Краснознаменная, М., 1961; Мордвинов Р. Н. Курсом «Авроры», М., 1962; Боевой путь Советского Военно-Морского Флота, М., 1967.

КАСПЛЯ, рака, левы прыток Зах. Дзвіны. Даўж. 136 *км*. Пачынаецца з воз. Каспля на тэр. Смаленскай вобл. РСФСР; у БССР (Віцебскі р-н) толькі ніжняе цячэнне (20 *км*). Рэльеф вадазбору (5410 *км*²) узгорыста-марэнны, паніжэнні забалочаныя. Пад балотамі 15%, пад лесам 14, разарана 40% тэр. Шыр. даліны 300—400 *м*. Найб. прытокі: Рутавеч, Вымнянка (злева); Жараспея, Габза (справа). Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Ледастаў з пач. снеж. да пач. красавіка. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 39 *м*³/*сек*.

КАСПРОВІЧ (Kasprowicz) Ян (12.12.1860, в. Шымбаж, каля Інаврoцлава — 1.8.1926), польскі паэт, драматург і перакладчык. Вучыўся ў Лейпцыгскім і Вроцлаўскім ун-тах. Друкавацца пачаў у 1882. У 1887 за патрыят. дзейнасць зняволены. З 1899 у Львове і Пароніне. У творчасці 80—90-х г. рэалістычна паказаны галеча і сац. канфлікты ў вёсцы (зб. «Вершы», 1889; «З мужыцкага загону», 1891; драмы «Канец свету», 1891; «Бунт Наперскага», 1899). Антырэліг. матывы ў паэме «Хрыстос» (1890), зб. вершаў «Свету, які гіне» (1902). Пасля 1905 у творах К. грамадскія супярэчнасці набываюць сімвалічную трактоўку, багаборніцкія матывы саступаюць месца рэліг.-містычным настроям, прымірэнню з сац. злом. Вершы К. на бел. мову перакладалі А. Гурыновіч і Я. Купала.

Тв.: Dzieła wybrane, t. 1—4, Kraków, 1958; бел. пер. у кн.— Беларускія пісьменнікі другой паловы XIX ст., Мн., 1956, с. 244—246; Купала Я. Збор твораў, т. 2, Мн., 1961. *У. М. Казбярук.* Мінск.

КАСПРУК Станіслаў Паўлавіч [н. 13(26).5. 1906, с. Манастырок Ляцічаўскага пав. Падольскай губ.], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Гомельскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1931. Скончыў Ленінградскае ваенна-паліт. вуч. імя Энгельса (1937). З 1928 у Чырв. Арміі, удзельнік сав.-фінляндскай вайны 1939—40. У партызанах з мая 1942 — камандзір групы, палітрук роты, камісар атрада; з жн. 1943 камісар *партызанскай брыгады 1-й Буда-Кашалёўскай* Гомельскай вобл. Пасля вайны на сав. і гасп. рабоце ў Гомельскай вобл. Узнаг. ордэнам Чырв. Сцяга, медалямі. Жыве ў Гомелі.

КАСПЯРОВІЧ Мікалай Іванавіч [9(22).5. 1900, в. Ізабелева Ігуменскага пав. Мінскай губ.— 3.4.1945], беларускі савецкі этнограф, мовазнавец і літаратуразнавец. З сялян. Скончыў Мінскі ін-т нар. асветы (1921). У 1917—21 настаўнічаў, з 1921 школьны інструктар Наркамасветы БССР, з 1922 інспектар Слуцкага і Віцебскага аддзелаў нар. асветы. У 1926—30 навук. сакратар Цэнтр. бюро краязнаўства пры Інбелкульце, потым АН БССР, у 1934—37 у Новасібірску — эканаміст, выкладчык тэхнікума. Аўтар «Беларуска-расійскага слоўнічка» (1925), «Віцебскага краёвага слоўніка» (1927), арт. па бел. этнаграфіі, л-ры і мастацтве: «Краязнаўства ў сучаснай графіцы», «Матывы барацьбы ў творчасці М. Багдановіча», «Асноўныя моманты гісторыі беларускага дойлідства», «Арганізаванае вывучэнне Беларусі ў XIX і пачатку XX ст.», «Беларуская літаратура ў Латвіі», «Вывучэнне быту рабочых» і інш. Апублікаваў невядомыя рукапісы К. Каганца.

Тв.: Беларуская архітэктура. Віцебск, 1925; Беларуская навука да Кастрычніка і пасля яго, Мн., 1927; Краязнаўства, Мн., 1929. *І. К. Германовіч.* Мінск.

КАССЕ, прыстань на р. Бярэзіна (прыток Дняпра), вёска ў Ясенскім с/с Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл. За 40 *км* на У ад Асіповіч, 120 *км* ад Магілёва, 12 *км* ад чыг. ст. Ялізава, на аўтамаб. дарозе в. Свіслач — в. Сычкава. 359 ж., гасп. 151 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін.

КАСТАЕДА, хвароба, тое, што *карыес зубоў*.

КАСТАЛОМ (Cynoglossum), род двух- і шматгадовых травяністых раслін сям. бурачнікавых. Вядома 70 відаў, пашыраных па ўсім зямным шары. У СССР 12 відаў, на Беларусі адзін — К. лекавы (C. officinale, нар. назвы: сабачы язык, шалянец).

Выш. К. 40—150 *см*. Лісце ланцэтападобнае, апушанае. Кветкі бурачырвоныя, сабраныя на канцах сцяблоў у завіткі. Плод — арэшак. Расце ў лясах, на лугах, пустках, каля жылля. Ядавітая расліна, змяшчае алкалоіды цынагласін, кансалідзін; мае ратыцыдныя і інсектыцыдныя ўласцівасці. Меданос. Ужываецца ў нар. медыцыне.

Літ.: Гл. пры арт. *Лекавыя расліны*.



Касталом лекавы.

КАСТАМАРАЎ Мікалай Іванавіч [4(16).5. 1817, с. Юрасаўцы Астрагожскага пав. Варонежскай губ.— 7(19).4.1885], рускі і ўкраінскі бурж. гісторык, пісьменнік. Скончыў Харкаўскі ун-т (1837). У 1846 праф. Кіеўскага, у 1859—1862 Пецярбургскага ун-таў. За ўдзел у *Кірыла-Мяфодзіеўскім таварыстве* ў 1847 зняволены ў Петрапаўлаўскай крэпасці, потым сасланы на 9 гадоў у Саратаў. Крытыкаваў пазіцыі славянафілаў, дзярж. гістарыяграфічнай школы за ігнараванне нар. мас у гісторыі. У працах шырока выкарыстоўваў матэрыялы з гісторыі Беларусі. Найважнейшыя пытанні рус. і ўкр. гісторыі тлумачыў з пазіцый бурж. гістарыяграфіі, спрабаваў даказаць бяскласавасць укр. нацыі. Яго ідэаліст. тэорыя «двух пачаткаў» — вечавога і адзінадзяржаўнага—нацыяналістычная. Аўтар паэт., драм. і публіцыст. твораў.

Тв.: Собр. соч., кн. 1—8, СПб., 1903—06; Русская история в жизнеописаниях ее главнейших деятелей, т. 1—3, П., 1915.

Літ.: Очерки истории исторической науки в СССР, т. 2, М., 1960; Полухін Л. К. Формування історичних поглядів М. І. Костомарова, Київ, 1959. *З. Ю. Капыскі.* Мінск.

КАСТАНЬЕТЫ (ісп. castañetas ад лац. castanea каштан), ударны музычны інструмент з дзвюх драўляных ці пластмасавых ракавін, змацаваных шнурком, якімі рытмічна пастукваюць. Традыц. нар. інструмент іспанцаў, пашыраны таксама ў Італіі, лацінаамер. краінах. Уваходзіць у сімф. аркестр.



КАСТАР (α Блізнят), адна з дзвюх яркіх зорак (другая па бляску) у сузор'і *Блізнят*; падвойная, зорныя велічыні кампанентаў К. 2,8 і 2,0.

КАСТАЎЕ, возера ў бас. Зах. Дзвіны, у Віцебскім р-не. Пл. 0,58 *км*². Даўж. 3,3 *км*, найб. шыр. 0,3 *км*, сярэдняя 0,1 *км*, найб. глыб. 7,5 *м*. Катлавіна выцягнута з ПнУ на ПдЗ. Вадазбор (8,5 *км*²) узгорысты, складзены з марэны. Сцёк з возера ў Зах. Дзвіну праз раку без назвы (даўж. 11 *км*). Водзяцца плотка, лешч, шчупак, акунь, верхаводка.

КАСТРА РУС (Castro Ruz) Фідэль (н. 13.8. 1927, мяст. Біран, правінцыя Ар'ентэ), паліт., дзярж. і ваенны дзеяч Кубы. З сям'і буйнога землеўладальніка. Па адукацыі юрыст, д-р права (1949). Са студэнцкіх гадоў уключыўся ў рэвалюц. дзейнасць. З пач. 50-х г. чл. Партыі кубінскага народа («артадоксаў»). Пасля ўстанаўлення праамер. ваен. дыктатуры Ф. Батысты (1952) аб'яднаў вакол сябе найб. рашучых членаў партыі «артадоксаў» і прадаўжаў рэвалюц. барацьбу. 26.7.1953 узначаліў узбр. напад на казармы Манкада ў г. Сант'яга-дэ-Куба з мэтай узняць народ на барацьбу супраць дыктатуры. Выступленне было жорстка задушана. К. Р. засуджаны на 15 гадоў турмы. У прамове на судзе выклаў праграму нац.-вызв. барацьбы і рэвалюц. пераўтварэнняў на Кубе. Пад націскам нар. мас у маі 1955 вызвалены. У тым жа годзе эміграваў у Мексіку. 2.12.1956 атрад з 82 чал. на чале з К. Р. высадзіўся на Кубу. Пасля цяжкага бою з урадавымі войскамі невялікая група прарвалася ў горы і пачала партыз. барацьбу. Неўзабаве яна вырасла ў Паўстанцкую армію. 1.1.1959 дыктатура Батысты скінута, улада перайшла ў рукі народа. У лютым 1959 К. Р. стаў прэм'ер-міністрам Рэвалюц. ўрада Кубы, узначаліў ажыццяўленне карэнных сац.-эканам. пераўтварэнняў, якія сталі асновай для пераходу краіны да сацыяліст. этапа рэвалюцыі. Першы сакратар Нац. кіраўніцтва Адзінай партыі сацыяліст. рэвалюцыі Кубы з моманту яе стварэння (1962), а пасля перайменавання гэтай партыі ў Кампартыю Кубы (КПК, 1965) першы сакратар ЦК КПК. Галоўнакамандуючы Рэвалюц. узбр. сіл (з 1959). К. Р.— Герой Савецкага Саюза (1963). Ленінская прэмія «За ўмацаванне міру паміж народамі» за 1960. Ганаровы д-р юрыд. навук Маск. ун-та (1963).



Тв.: Рус. пер.— Речи и выступления, М., 1960; Речи и выступления. 1961—1963, М., 1963; Наше дело побеждает. Речи и выступления 1963—1964, М., 1965.

КАСТРАВІЦКІ Казімір Карлавіч (10.2.1868, Табольск — 20.5.1918), беларускі пісьменнік, мастак і графік. У л-ры вядомы пад псеўд. *Каганец* Карусь.

КАСТРАМА, горад, цэнтр Кастрамской вобл. РСФСР. На левым беразе Волгі пры ўпадзенні ў яе р. Кастрамы. Вядомы з 12 ст.

Рачны порт, вузел чыг., аэрапорт. 227 тыс. ж. (1971). Адзін з найстарэйшых цэнтраў тэкст. (ільняной) прамысловасці. 2 ільнокамбінаты, 4 ільнофабрыкі. Лясная і дрэваапр. прамысловасць, машынабудаванне і металаапрацоўка. З-ды: экскаватарны, суднамеханічны, тэкст. машынабудавання, фанерны камбінат. ЦЭЦ. Вытворчасць буд. матэрыялаў. Прадпрыемствы абутковай і харч. прамысловасці. Тэхнал., пед., с.-г. ін-ты; 9 сярэд. спец. навуч. устаноў. 2 т-ры (драм. і лялечны). Краязн. музей, карцін. галерэя.

КАСТРАМА Аляксандр Якаўлевіч (н. 14.10. 1921, в. Галубовічы Рэчыцкага пав. Мінскай губ.), кавалер ордэнаў Славы трох ступеняў. З сялян. З 1940 у Магілёве на чыгунцы. У Айч. вайну ў партызанах — падрыўнік. З ліст. 1943 у Сав. Арміі — кулямётчык. Вызначыўся ў 1943 у баі каля г. п. Парычы Гомельскай вобл.; у 1944 пры фарсіраванні воднага рубяжа і ў баі за плацдарм у Польшчы; у 1945 у баях ва Усх. Прусіі. Жыве ў в. Салтанова Рэчыцкага р-на.

КАСТРАМСКАЯ парода буйной рагатай жывёлы, пародa малочна-мясного кірунку, выведзеная ў Кастрамской вобл. (гал. ч. у саўгасе «Караваева») скрыжаваннем мясцовай жывёлы з альгаўскай і швіцкай пародамі. Зацверджана ў 1945. Гадуюць у Кастрамской, Іванаўскай, Яраслаўскай, Уладзімірскай абл., у БССР (планавая парода для Магілёўскай і Віцебскай абл.).

Жывёлы моцнай канстытуцыі, з добра развітай мускулатурай. Масць шэрая і бурая розных адценняў. Надой малака за год 4000—5000 *кг* (рэкардыстки даюць да 16 000 *кг*), тлустасць 3,7—4,1%. Жывая маса кароў 540—580, быкоў 800—900 *кг*. Забойны выхад 56—58%. На племзаводзе «Полымя» (Віцебская вобл., 1969) за 300 дзён лактацыі рэкардыстка далі: Тайпан — 7886 *кг* малака тлустасцю 3,7%, Футляршчыца — 6985 *кг* — 4,09%. Ін. гл. на ўкл. да арт. *Буйная рагатая жывёла.*

Літ.: Горский Н. А. Костромская порода скота в колхозах, М., 1952; Гайко А. А. Костромская порода скота в Белорусской ССР и перспективы ее разведения, Мн., 1953 (бібліягр.); Сидоренко Г. М. Костромская и швицкая породы крупного рогатого скота в Белоруссии, Мн., 1969.

КАСТРАМСКАЯ ВОБЛАСЦЬ, у складзе РСФСР. Утворана 13.8.1944. Размешчана ў цэнтры Еўрапейскай ч. СССР, у бас. верхняй Волгі. Пл. 60,1 тыс. км². Нас. 851 тыс. чал. (1971). Падзяляецца на 24 раёны; 11 гарадоў, 18 гар. пасёлкаў. Цэнтр г. Кастрама.

Паверхня — хвалістая раўніна. На З Кастрамская нізіна (выш. каля 80 *м*), на ПдЗ шырокая даліна Волгі. З Пн на Пд вобласць перасякае Галіцкае ўзв. выш. да 293 *м*. На ПнУ адгор'і Паўн. Увалаў. Карысныя выкапні: торф, мінер. буд. матэрыялы, гаручыя сланцы, фасфарыты. Мінер. крыніцы. Клімат умерана кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. —12, ліп. 18,9 °С. Ападкаў 500—550 *мм* за год. Вегет. перыяд каля 160 дзён. Найб. рака Волга з левымі прытокамі: Кастрамой, Унжай, Вятлугай. Азёры Галіцкае і Чухламскае. Глебы пераважна дзярнова-падзолістыя і балотныя, у поймах рэк алювіяльныя. Пад лесам больш за 60% тэр. (хвойныя, з лісцевых бяроза, асіна). Асн. насельніцтва рускія. Сярэдняя шчыльн. 14,1 чал. на 1 км². Гарадскога нас. 56%. Найб. гарады: Кастрама, Буй, Нерахта, Шар'я, Галіч.

Аб'ём валавой прадукцыі ўсёй прамысловасці ў 1970 павялічыўся ў параўнанні з 1940 у 5,5 раза. Гал. галіны прамысл.— лясная і дрэваапрацоўчая, тэкст., машынабудаванне. Цэнтры лесапілавання і дрэваапрацоўкі — Кастрама, Буй, Мантурава, Нея, Шар'я. Тэкст. прамысловасць — пераважна льняная (2-е месца ў РСФСР па выпуску льняных тканін). 2 ільнокамбінаты і 4 ільнофабрыкі ў Кастраме, ільнокамбінат у Нерахце. Машынабудаванне і металаапрацоўка: з-ды — суднамеханічны, імя Красіна (машыны для гумавай прамысловасці), «Тэкстыльмаш», фарбавальнаапр. абсталявання, дрэваапр. станкоў, каларыферны, «Строммашына» ў Кастраме, экскаватарны ў Галічы. У Буі хім. з-д, у Салігалічы вапняковы камбінат, у Нейскім р-не шклозавод. Будуюцца (1971) з-д «Маторадталь» у Кастраме і біяхім. з-д у Мантураве. Прадпрыемствы швейнай, абутковай, трыкатажнай, харч. прамысловасці. Кастрамская ДРЭС у Валгарэчанску, ЦЭЦ і ЦЭЦ-2 (будуецца, 1971) у Кастраме. Разнастайныя саматужныя промыслы, у т. л. ювелірныя ў в. Краснае-на-Волзе. С. гасп. спецыялізуецца на льнаводстве і малочна-мясной жывёлагадоўлі. На 1.1.1971 у К. в. 201 калгас і 107 саўгасаў. Пасяўная пл. (тыс. *га*, 1970) 585,9, у т. л. пад збожжавымі 246,4, кармавымі 256,9, ільном 44, бульбай 35, агароднінай 13,5. Асн. збожжавыя культуры (тыс. *га*): жыта 110,4, авёс 56,1, пшаніца 46,8. На пач. 1971 (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 332,9 (у т. л. кароў 167,6), свіней 98, авечак і коз 227,9. Даўж. чыгунак 592 *км* (1970). Чыгункі Буй — Мантурава — Кіраў, Масква — Кастрама, Кастрама — Галіч. Аўтамаб. дарог 9,5 тыс. *км*, у т. л. з цвёрдым пакрыццём 1,6 тыс. *км*. Суднаходства па Волзе, Кастраме, Унжы, Вятлузе.


КАСТРАМСКАЯ ВОБЛАСЦЬ
Масштаб 1:4 500 000
45 0 45 90 км
ВАЛДАЙСКАЯ ВОБЛ.
ЯРАСЛАЎСКАЯ ВОБЛ.
КІРАЎСКАЯ ВОБЛ.
ГАРЬКОЎСКАЯ ВОБЛ.
ІВАНАЎСКАЯ ВОБЛ.
Волга
Унжа
Вятлуга
Кастрама
Буй
Шар'я
Нерахта
Галіч
Валгарэчанск
Варнавіна
Горадзец
Макар'ева
Нікола-Макар'ева
Чухлама
Татарава
Мантурава
Нея
Парфенева
Сандогара
Сумароко
Сусліслаў
Краснае-на-Волзе
Пакроўскае
Юрава
Горкі
Усце
Урэнь
Фурманаў
Іванава
Кінешма
Макар'ева
Пыцінскае
Пятраўскі
Ракіна
Высокае
Грушына
Пермас
Ніколь
Старое
Сухона
Шыліна
Грязьцы
Вохтага
Таліца
Шушкадом
Любім
Кастрама
Сандогара
Сумароко
Сусліслаў
Шарапіха
Сяўрэнга
Ваўрэнга
Прокіна
Лопарава
Палкіна
Камунар
Славіна
Ізадзева
Астроўскае
Пагост
Кавій
Каменіна
Краснае-на-Волзе
Нерахта
Заволасе
Прыволасе
Далматоўскі
Нікольскае
Ізмайлава
Гарбуна
Кіязарава
Ветлужскі
Зеленаі
Шарга
Нешкуба
Ражджаственскае
Сяўна
Катуніна
Шымшына
Макар'е
Ветлуга
Вазлова
Трашкова
Варнавіна
Горкі
Усце
Урэнь
Чухлама
Татарава
Мантурава
Нея
Парфенева
Нікола-Бераэвец
Архава
Кея
Антропава
Шушкадом
Таліца
Грязьцы
Вохтага
Сяўрэнга
Сухона
Старое
Шыліна
Ялма
Кадзіна
Суба
Карцова
Сялігалічскае
Ялгіна
Ваўрэнга
Сандогара
Сумароко
Сусліслаў
Шарапіха

што з'явілася першай перамогай рэвалюц. мас і на кароткі тэрмін дало свабоду слова, сходаў, друку, саюзаў. Буржуазія, задаволеная маніфестам, перайшла да падтрымкі ўрада. Бальшавікі выкрывалі сутнасць царскага маніфеста і заклікалі не спыняць барацьбы.

11—12 кастр. ў Мінску забаставалі чыгуначнікі, выбраны забастовачны к-т. Спыніўся рух на Маскоўска-Брэсцкай і Лібава-Роменскай чыг. У сувязі з царскім маніфестам у Мінску на вакзальнай плошчы 18 кастр. адбыўся 10-тысячны мітынг, які закончыўся расстрэлам (гл. *Курлоўскі расстрэл*). Створаны ў Мінску *кааліцыйны Савет* з прадстаўнікоў Мінскай групы РСДРП, Лібава-Роменскага к-та Усерасійскага чыг. саюза, мінскіх к-таў эсэраў і Бунда праводзіў мітынгі, арганізаваў камісію ўзаемадапамогі. Масавыя дэманстрацыі і сутычкі з паліцыяй адбыліся 14 кастр. ў Гомелі, 18 кастр. на мітынгах працоўных горада выступалі бальшавікі, якія растлумачвалі сутнасць царскага маніфеста, былі арганізаваны забастовачны к-т і дружына. У Віцебску 18 кастр. супраць мітынгу працоўных улады накіравалі казакоў. У выніку сутычкі 18 чал. забіта і некалькі дзесяткаў паранена. У дзень пахавання ахвяр расстрэлу адбылася дэманстрацыя, па патрабаванні працоўных з турмы вызвалены паліт. вязні. Для кіраўніцтва рэвалюц. барацьбой у Віцебску створана кааліцыйная камісія з прадстаўнікоў групы РСДРП, Бунда і Паалей-Цыёна. Камісія арганізавала гарадскую міліцыю. У Мазыры пад кіраўніцтвам рэвалюц. к-та працоўныя спрабавалі захапіць зброю са складаў, вызваліць паліт. вязняў, аднак выступленне было разгромлена. Масавыя паліт. дэманстрацыі і мітынгі адбыліся ў Оршы. Кааліцыйны Савет у Мінску, кааліцыйная камісія ў Віцебску, стачачныя к-ты ў інш. гарадах Беларусі не з'яўляліся органамі ўзбр. паўстання і рэвалюц. улады, аднак былі зачаткамі органаў новай улады. К. ў. п. с. на Беларусі праходзіла пад заклікамі «Далоў самадзяржаўе!», «Няхай жыве дэмакратычная рэспубліка!». У стачцы таксама ўдзельнічалі працоўныя Магілёва, Полацка, Пінска, Брэста, Бабруйска, Баранавіч, Гродна, Слуцка, Ліды, Барысава, Капыля, Смалявіч, Пухавіч, Шклова, Смаргоні, Ашмян, Рэчыцы, Нясвіжа, Копысі, Горак, Навагрудка. У Маскве К. ў. п. с. спынена 21—22 кастр. паводле рашэння Маскоўскага к-та РСДРП, у многіх гарадах працягвалася да канца кастрычніка. Пасля стачкі бальшавікі пачалі рыхтаваць пралетарыят да ўзброенага паўстання (гл. *Снежаньскае ўзброенае паўстанне 1905*).

Літ.: Гл. пры арт. *Рэвалюцыя 1905—07 у Расіі*. *А. У. Царук*. Мінск.

КАСТЫ (партуг. casta род, пакаленне), эндагамныя групы людзей, аб'яднаныя адзінствам спадчынных прафесій, строга абмежаваныя ў зносінах адна з адной. У старажытнасці прыкметы каставага падзелу сустракаліся ў Кітаі, Іране, Японіі, Егіпце і інш. Пануючай сілай К. сталі ў Індыі. Паявіліся з падзелам працы ў працэсе распаду родавага ладу і ўтварэння класавага грамадства.

Законы К. сталі рэліг. законамі. Любая новая саслоўна-класавая, прафес. ці рэліг. група набывала форму К. Паводле перапісу 1931 у Індыі было каля 3500 К. Характэрнае для К.— яе замкнёнасць, адасобленасць, асаблівы рэліг. рытуал, перадача прафесіі наступным пакаленням як неад'емнае права пэўнай К. Каставыя саветы, т. зв. панчаяты, кантралявалі эканам. і грамадскую дзейнасць членаў К. Выгнанне з К. ставіла чалавека па-за грамадствам. Асабліва бяспраўнае было становішча ніжэйшай К., т. зв. «недатыкальных», паводле рэліг. традыцыі людзей «нячыстых» прафесій (прыбіральшчыкаў, шаўцоў і інш.), цяпер у асн. кабальных батракоў. Каланізатарская палітыка англічан у Індыі спрыяла захаванню каставай сістэмы. Развіццё капіталізму, які парушыў прынцып спадчыннасці прафесій, зменшыла ўплыў К., аднак сістэма К. захавалася да абвяшчэння Індыі незалежнай дзяржавай (1947). Урад Індыі ажыццяўляе мерапрыемствы, каб палепшыць становішча «недатыкальных». Сістэма К. юрыдычна ліквідавана, аднак фактычна ўсё яшчэ існуе.

Літ.: Новая история Индии, М., 1961; Касты в Индии, М., 1965. *Р. М. Трухноў*. Мінск.

КАСЦЁЙ І СУСТА́ВАЎ ХВАРО́БЫ, хваробы апорна-рухальнай сістэмы ў чалавека.

Траўматычныя К. і с. х. бываюць ад мех. пашкоджанняў (удары касцей і суставаў, *пераломы*, расцяжэнні звязак). Запаленні ўзнікаюць ад неспецыфічных (стафілакокі, стрэптакокі) і спецыфічных (туберкулёз і інш.) інфекцый. Запаленне суставаў — *артрыты*, запаленне косці — *астыт*, *астэаміэліт*, панастыт. Дыстрафічныя хваробы бываюць ад парушэння ўнутрыкасцявога абмену рэчываў, уключаюць групу астэадыстрафій (эндакрынных, таксічных, аліментарных, асепсічных і інш.). Дыспластычныя ўзнікаюць ад прыроджаных заган развіцця касцей і суставаў (недасканалы астэагенез, хондрадыстрафія і інш.). Пухліны касцей і суставаў бываюць дабраякасныя (астэомы, гемангіёмы і інш.) і злаякасныя (астэагенная саркома і інш.; гл. *Пухліны*). Прыкметы К. і с. х.: боль у касцях, парушэнне формы і функцыі касцей і суставаў. Распазнаюць хваробы клінічнымі, рэнтгеналагічнымі і лабараторнымі метадамі. Лячэнне: кансерватыўнае і хірургічнае.

Літ.: Астапенко М. Г. и Пихлак Э. Г. Болезни суставов, М., 1966 (бібліягр.); Чаклин В. Д. Основы оперативной ортопедии и травматологии, М., 1964; Рейнберг С. А. Рентгенодиагностика заболеваний костей и суставов, т. 1—2, 4 изд., М., 1964; Шапиро М. Н. и Цыпкин Б. Н. Клиника эпифизеонекрозов и апофизитов, Мн., 1935; Крюк А. С. Варусная деформация шейки бедренной кости. Мн., 1970. *А. С. Крук*. Мінск.

КАСЦЕНІ́Ч Ерафей Васілевіч [4(16).10.1854, в. Мужычкі Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ.— 24.12.1905(6.1.1906)], рускі вучоны ў галіне афтальмалогіі. Д-р мед. н. (1887), праф. (1893). Скончыў Пецярбургскую ваен.-мед. акадэмію (1883). Праф. Варшаўскага ваен. шпіталя (1894—1900), заг. вочнай клінікі і дырэктар вочнай лячэбніцы ў Пецярбурзе (1900—06). На летніх канікулах бясплатна лячыў і рабіў хірург. аперацыі сялянам Магілёўскай і інш. губ. на Беларусі. Асн. працы па пытаннях афтальмалогіі. Удасканаліў шэраг афтальмалагічных аперацый. Помнік К. (1964) на магіле ў в. Чырвоны Асавец Быхаўскага р-на Магілёўскай вобл.

Тв.: Развитие палочек, колбочек и наружного ядерного слоя в сетчатке зародыша человека. Дис., СПб., 1887.

КАСЦЁНКА Аляксандр Сцяпанавіч (н. 26.12.1893, пас. Шчоткіна Рослаўскага пав. Смаленскай губ.), удзельнік барацьбы за Сав. ўладу на Беларусі. З сялян. Чл. КПСС з 1912. З ліп. 1917 старшыня к-та РСДРП(б) і сакратар Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў у Рэчыцы. З 1919 сакратар Рэчыцкага пав. к-та РКП(б), камісар зямельнай і лясной гаспадаркі. З жн. 1919 на парт. і сав. рабоце (Гомель, Бранск, Рэчыца і інш.). У Айч. вайну камісар перасоўнага хірург. шпіталя. У 1949—54 народны суддзя г. Рэчыцы. Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі. Жыве ў Рэчыцы.

КАСЦЕ́НКА Міхаіл Паліеўктавіч [н. 16(28).12.1889, с. Вейдзелеўка Валуйскага пав. Варонежскай губ.], савецкі вучоны ў галіне электратэхнікі. Акад. АН СССР (1953; чл.-кар., 1939). Герой Сац. Працы (1969). Скончыў Петраградскі політэхн. ін-т (1918), працаваў у ім выкладчыкам. У 1939—50 заг. лабараторыі Энергетычнага ін-та АН СССР; у 1950—55 заг. Ленінградскага аддз. Ін-та аўтаматыкі і тэлемеханікі АН СССР; у 1956—66 дырэктар Ін-та электрамеханікі АН СССР (Ленінград). Навук. працы па тэорыі эл. машын і метадах іх эксперым. даследавання і праектавання, па пытаннях эл. цягі на пераменным току, па пераўтварэнні пераменнага току ў пастаянны. Дэп. Вярх. Савета СССР 5-га скл. Дзярж. прэміі СССР 1949, 1951, Ленінская прэмія 1958. Узнаг. 3 ордэнамі Леніна, 2 ордэнамі Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.



КАСЦЕ́НКА Фёдар Дзмітрыевіч (6.6.1919, с. Пакроўка Каінскай акр. Томскай губ.— 14.11.1962), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1946. На фронце з 1941. Вызначыўся ў Магілёўскай вобл. У чэрв. 1944 аддзяленне кулямётчыкаў на чале з К. першае фарсіравала р. Басю, заняло варожую траншэю; 25.6.1944 фарсіравала Дняпро; трапіўшы ў акружэнне танкаў і мотапяхоты, вяло бой да падыходу падмацавання.

КАСЦЕ́НЧЫК Авянір Маркавіч (1889, Гродна — 1935), лётчык, камандзір першага ў свеце цяжкага самалёта-бамбардзіроўшчыка «Ілья Мурамец». Вучыўся ў Гатчынскай авіяц. школе. Першы пачаў лятаць на 4-маторным цяжкім самалёце. За заслугі ў 1-ю сусв. вайну ўзнаг. ордэнам св. Георгія.

КАСЦЕ́РЫН Сямён Пятровіч (15.1.1924, в. Касцяраты Яранскага пав. Вяцкай губ.— 27.7.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. ВЛКСМ. На фронце з 1943. У баі пад Слуцкам у чэрв. 1944 разлік гарматы пад камандаваннем ст. сяржанта К. знішчыў 4 танкі праціўніка. 27.7.1944 у няроўным баі з 18 варожымі танкамі на ПнЗ ад Брэста К. асабіста падбіў 3 танкі. Загінуў у гэтым баі.

КАСЦЮКЕ́ВІЧ Мікалай Ігнатавіч [н. 26.4(9.5).1904, в. Варкавічы Слуцкага пав. Мінскай губ.], беларускі савецкі вучоны ў галіне лясной метэаралогіі. Д-р с.-г. навук (1961), праф. (1962). Чл. КПСС з 1940. Скончыў Бел. с.-г. акадэмію (1928). Удзельнік Айч. вайны. У 1947—56 працаваў у Ін-це лесу АН БССР. З 1957 дацэнт кафедры метэаралогіі і кліматалогіі Бел. лесатэхн. ін-та (з 1961 Бел. тэхнал. ін-т імя Кірава), з 1963 заг. кафедры аховы працы і лясной метэаралогіі гэтага ін-та. Асн. працы па гідралагічнай ролі лясоў Палесся.

Тв.: К порайонной характеристике лесорастительных условий БССР, у кн.: Леса Белорусской ССР, Мн., 1954; Водоохранная роль лесов Белорусской республики, у кн.: Вопросы лесоведения и лесоводства, в. 1, Мн., 1965; Роль леса в воздействии на климат и микроклимат, у кн.: Вопросы лесного хозяйства, лесной и химической промышленности, Мн., 1967; Введение в лесную метеорологию, Мн., 1969; (разам з А. Х. Шклярам) Атмосферный воздух и охрана его от загрязнений, у кн.: Охрана природы, Мн., 1969.

КАСЦЮКІ, вёска ў Весялоўскім с/с Барысаўскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса імя Кутузава. За 23 *км* на ПнЗ ад Барысава, 94 *км* ад Мінска, на аўтамаб. дарозе г. Барысаў — в. Зембін. 460 ж., гасп. 134 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. Каля К., на Бярэзіне, 14—16 (26—28).11.1812 рус. армія пад камандаваннем М. І. Кутузава разграміла напалеонаўскія войскі. У гонар 100-годдзя з дня перамогі і на ўшанаванне памяці воінаў, якія загінулі ў баі на Бярэзіне, устаноўлена мемарыяльная дошка. 2 помнікі: у гонар 150-годдзя з дня разгрому напалеонаўскай арміі і землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. У 1944 нямфаш. захопнікі спалілі вёску.

КАСЦЮКО́ВІЦКІ РАЁН, у складзе Магілёўскай вобл. Утвораны 17.7.1924. Размешчаны на У вобл. Пл. 1,5 тыс. *км²*. Нас. 46,0 тыс. чал. (1971). Падзяляецца на 11 сельсаветаў. Цэнтр г. Касцюковічы.

Тэр. раёна ў межах *Аршанска-Магілёўскай раўніны*. Карысныя выкапні: радовішча цэментавай сыравіны Камунарскае з запасамі больш за 200 млн. *т*; радовішча мелу Прашаў (каля в. Канічы) — 2,2 млн. *т*; 7 радовішчаў цагельнай сыравіны — 0,13 млн. *т*. Сярэдняя т-ра студз. —7,8, ліп. 18,5 °С. Ападкаў 610 *мм* за год. Вегет. перыяд 185 дзён. Рэкі Беседзь і яе прытокі Сураў, Крупня з Жадунькай, Дзяражня, Зубар. Пад лесам 26% тэр. Найбольшая лясістасць у цэнтр. частцы раёна. Растуць хвоя, елка, бяроза, асіна, вольха. Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (47%), дзярнова-падзолістыя забалачальныя (31,5%),

Возера Святое каля в. Зарэчча.





дзярновыя і дзярнова-карбанатныя забалачальныя (14,2%), алювіяльныя дзярнова-балотныя і тарфяна-балотныя (7%) і інш. З мінер. глебаў 36,8% суглінкавых, 48,2 супясчаных, 15% пясчаных. Якасная ацэнка глебаў у балах: ворных зямель 44 (цана бала 0,23 *ц/га* збожжа), кармавых угоддзяў 18, усіх с.-г. угоддзяў 35. Насяляюць раён беларусы, ёсць рускія, украінцы, яўрэі і інш. Сярэдняя шчыльн. 30,7 чал. на 1 *км*². Гарадскога нас. 15,4%.

Прамысл. прадпрыемствы размешчаны ў Касцюковічах: філіял Клімавіцкага з-да масла і сухога малака, спіртзавод, хлебакамбінат, ільнозавод, камбінаты прамысловы і быт. абслугоўвання, раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі. У раёне 14 калгасаў і 11 саўгасаў (1971).

Калгасы і іх цэнтры: «Дружба» *(Прусіна)*, «Зара» *(Сялічы)*, імя Калініна *(Гайрыленка)*, «Краштат» *(Вітуха)*, імя Леніна *(Вялікая Васькоўня)*, «Ленінская іскра» *(Муравяліе)*, імя К. Маркса *(Відуйцы)*, «Парыжская камуна» *(Слабада)*, «1 Мая» *(Пралетарскае)*, «Праўда» *(Машавое)*, «Радзіма» *(Вітунь)*, «Расія» *(Шарэйкі)*, «Савецкая Беларусь» *(Пячары)*, імя Суворава *(Тупічын)*. Саўгасы і іх цэнтры: «Баронькі» *(Баронькі)*, «Брацкі» *(Брацкавічы)*, «Дуброва» *(Белая Дуброва)*, «Забычанне» *(Забычанне)*, «Зарэчны» (Вялікі Бор), «Канічы» *(Канічы)*, «Ленінскі шлях» *(Нізькі)*, «Печанеж» *(Печанеж)*, «Самацэвічы» *(Самацэвічы)*, «40 гадоў Кастрычніка» *(Бялынкавічы)*, «Сялецкі» *(Сялец)*.

С. гасп. спецыялізуецца на вытворчасці мяса, малака, ільновалакна, вырошчваюць збожжавыя і бульбу. Пад с.-г. ўгоддзямі 63% тэр. Агульная пасяўная пл. (тыс. *га*, 1970) 55,0, з іх пад збожжавымі і зернебабовымі 24,5, тэхн. (лён-даўгунец) 2,3, бульбай 9,8, кармавымі 18,1. На пач. 1971 было (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 43,9 (у т. л. кароў 20,3), свіней 38,4, авечак і коз 5,4. Па тэр. раёна праходзіць чыгунка Орша — Унеча, аўтамаб. дарогі злучаюць Касцюковічы з Клімавічамі, Хоцімскам, Краснаполлем і інш. У раёне (1971) 15 сярэдніх, 20 васьмігадовых, 59 пач. школ, школа рабочай моладзі, санаторная школа-інтэрнат, 8 дашкольных устаноў, 43 клубныя ўстановы, 50 масавых б-к, 37 кінаўстановак (у т. л. 15 стацыянарных), 7 бальніц, 30 фельч.-ак. пунктаў. У раёне працуе 690 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, у т. л. 49 інжынераў, 56 аграномаў, 68 заатэхнікаў, 7 вет. урачоў, 33 эканамісты, 390 настаўнікаў, 53 урачы; 1223 чал. з сярэдняй спец. адукацыяй. Раённая газ. «Сцяг камунізма».

КАСЦЮКОВІЧ Пётр Іванавіч (н. 16.8.1923, в. Казекі Аршанскага пав. Віцебскай губ.), кавалер ордэнаў Славы трох ступеняў. З сялян. Чл. КПСС з 1944. У Айч. вайну на фронце з 1942 — сяржант, камандзір мінамётнага разліку. Удзельнік баёў на Калінінскім, Бранскім, 1-м і 2-м Бел. франтах. Вызначыўся пры вызваленні Магілёва, авалоданні крэпасцю Асавец, у баях за Данцыг (Гданск) і выхад да Балтыйскага м. Жыве ў Оршы.

КАСЦЮКОВІЧ Фёдар Трафімавіч [н. 16.2 (1.3).1902, в. Боркі Барысаўскага пав. Мінскай губ.], беларускі савецкі вучоны ў галіне эканомікі лесу. Д-р с.-г. н. (1966), праф. (1967). Чл. КПСС з 1927. Скончыў Бел. с.-г. акадэмію (1928). Удзельнік Айч. вайны. У 1948—53 дырэктар Бел. НДІ лясной гасп., у 1953—62 дырэктар і заг. кафедры Бел. лесатэхн. ін-та (з 1961 Бел. тэхналагічны ін-т). З 1967 праф. кафедры эканомікі с. гасп. Бел. ін-та нар. гаспадаркі. Асн. працы па пытаннях эканомікі лясной і сельскай гаспадаркі. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.

Тв.: Лясная гаспадарка БССР і яе размяшчэнне. Мн., 1936; Вопросы экономики и планирования лесохозяйственного производства, Мн., 1960.

КАСЦЮКОВІЧЫ, горад (з 1938), цэнтр Касцюковіцкага р-на Магілёўскай вобл., на р. Жадунька. За 151 *км* на ПдУ ад Магілёва, 3 *км* ад чыг. ст. Камунары. 7,1 тыс. ж. (1971). Прамысл. прадпрыемствы: філіял Клімавіцкага з-да масла і сухога малака, спіртзавод, хлебакамбінат, прамкамбінат (выраб цэглы, сценавых блокаў, піламатэрыялаў), камбінат быт. абслугоўвання, раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі, ільнозавод. 2 сярэдняя, 2 пач. школы, санаторная школа-інтэрнат, школа рабочай моладзі, 3 дашкольныя ўстановы, Дом піянераў, муз. і спарт. школы, Дом культуры, кінатэатр, 2 б-кі, бальніца, краязнаўчы музей. Помнік У. І. Леніну. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны.

Склад збожжа ў саўгасе «40 гадоў Кастрычніка».





Касцюковічы. Вуліца Ленінская.

Вядомы з канца 17 ст. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) мястэчка Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ., цэнтр воласці. У 1897 у К. 700 ж. Сав. ўлада ўстаноўлена ў ліст. 1917. З 1924 цэнтр раёна. З 13.8.1941 да 28.9.1943 акупаваны нямецка-фаш. захопнікамі. У 1942—43 на тэр. раёна дзейнічалі падпольныя райкомы КП(б)Б і ЛКСМБ. У Айч. вайну амаль поўнасцю спалены.

КАСЦЮКОЎКА, рабочы пасёлак (з 1935) у Гомельскай вобл. Падпарадкоўваецца Чыгуначнаму раённаму Савету г. Гомеля. Чыг. ст. на лініі Гомель — Жлобін; за 12 *км* на Пн ад Гомеля. 10,1 тыс. ж. (1971). Вядома як станцыя Лібава-Роменскай чыгункі з 1873. З 1929—30 пасёлак рабочых Гомельскага шклозавода імя Ламаносава. У Айч. вайну разбураны. Прамысл. прадпрыемствы: *Гомельскі шклозавод*, камбінат быт. абслугоўвання, цэх швейных вырабаў, майстэрня па рамонце тэлевізараў. 2 сярэднія, васьмігадовая школы, школа-інтэрнат, школа рабочай моладзі, муз. школа, 4 дзіцячыя сады, сельскае прафес.-тэхн. вуч. механізацыі меліярац. работ. Палац культуры, масавая б-ка, бальніца. Брацкая магіла 15 сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну. Помнік абаронцам Гомеля ў 1941. На шклозаводзе помнік і вечны агонь на ўшанаванне памяці 79 рабочых і служачых, якія загінулі ў Айч. вайну.

Касцюкоўка. Вуліца Кастрычніцкая.



КАСЦЮКОЎКА, вёска ў Яромінскім с/с Гомельскага р-на. Цэнтр вуч.-доследнай гасп. сельскага прафес.-тэхн. вуч. механізацыі меліярац. работ. За 12 *км* па Пн ад Гомеля, 1 *км* ад чыг. ст. Касцюкоўка, каля аўтамаб. дарогі Ленінград — Адэса (2 *км*). 1556 ж., гасп. 440 (1971). Ф-ка швейных вырабаў. Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін.

КАСЦЮЧЫК Пётр Васілевіч (вер. 1923, в. Рыбцы Ігуменскага пав. Мінскай губ.— 15.1.1945), Герой Сав. Саюза (1945). З сялян. На фронце з вер. 1944 — сувязіст. Вызначыўся пры вызваленні Польшчы. 14.1.1945 пад варожым агнём выправіў 46 пашкоджанняў на лініі сувязі. 15.1.1945 закрыў сабою амбразуру дзота, з якога гітлераўцы вялі кулямётны агонь па сав. пяхоце. Пахаваны ў в. Мішауры Радамскага ваяводства.



КАСЦЮЧЭНКА Надзея Лявонаўна (8.11. 1922, в. Лутава Лепельскага пав. Віцебскай губ.— 8.6.1943), партызанка, герой Вял. Айч. вайны. З сялян. Чл. ВЛКСМ. З вер. 1941 сувязная партыз. атрада «Дубава». У партызанах з мая 1942— кулямётчыца партыз. брыгады «Дубава». Вызначылася ў баях за мяст. Пышна. Некалькі дзён з яе ўдзелам партызаны адбівалі варожыя атакі. Калі танк і больш за 50 фашыстаў прарваліся ў партыз. абарону, К. са звязкам гранат кінулася пад машыну, падарвала яе і загінула сама. Узнаг. ордэнам Айч. вайны 1-й ступені.



Літ.: Шлык Ф. и Шопа П. Во имя Родины, Мн., 1971, с. 163—164.

КАСЦЮШКА (Kościuszko) Андрэй Тадэвуш Банавентура [4.2.1746, фальварак Мерачоўшчына каля Косава (з 15.1.1940 Іванцэвіцкі р-н Брэсцкай вобл.) — 15.10.1817], паліт. і ваенны дзеяч Рэчы Паспалітай, кіраўнік нац.-вызв. *паўстання 1794*. З бел. шляхецкага роду (гл. *Касцюшкі*). Скончыў Варшаўскі кадэцкі корпус (1766) і вучыўся ў Парыжскай акадэміі жывапісу і скульптуры (1769—74). У Францыі ўдасканаліў ваен. веды і пазнаёміўся з прагрэс. тэорыямі франц. матэрыялістаў, якія зрабілі значны ўплыў на фарміраванне яго светапогляду. У 1776—83 добраахвотнікам удзельнічаў у вайне за незалежнасць ЗША. Дзякуючы ваен. таленту К., амер. армія атрымала адну з найважнейшых



перамог пад Саратогай (1777). У 1784 у чыне брыгаднага генерала вярнуўся на радзіму, але камандную пасаду ў польскай арміі атрымаў толькі ў канцы 1789. У 1792, абараняючы *канстытуцыю 3 мая 1791*, удзельнічаў у вайне супраць Расіі і *Таргавіцкай канфедэрацыі*. Пасля капітуляцыі Рэчы Паспалітай эміграваў, актыўна ўдзельнічаў у падрыхтоўцы планаў ліквідацыі вынікаў *Гродзенскага сейма* 1793 (2-і падзел Рэчы Паспалітай). Аб'яўлены галоўнакамандуючым узброеных сіл паўстання 1794 у Польшчы, на Беларусі і ў Літве. Пад яго кіраўніцтвам паўстанцкая армія 4 крас. пад Рацлавіцамі разбіла атрад ген. Тармасава. К. імкнуўся, каб паўстанне мела агульнанародны дэмакр. характар. 7 мая быў выданы маніфест, т. зв. Паланецкі універсал, у якім сялянам абяцалася вызваленне з-пад прыгону і некаторае паменшэнне феад. павіннасцей. Аднак нават нямногія ўступкі сялянству сустрэлі супраціўленне шляхты. К. не адважыўся ўступіць з ёю ў канфлікт. Не падтрымаў і барацьбы гарадскіх нізоў Варшавы са здраднікамі-арыстакратамі. Усё гэта садзейнічала паражэнню паўстання. У бітве каля Мацяёвіцаў (10 кастр.) К. быў цяжка паранены, узяты ў палон і зняволены ў Петрапаўлаўскую крэпасць. Пасля вызвалення (1796) выехаў у ЗША, у 1798 вярнуўся ў Еўропу. Адмовіўся супрацоўнічаць з Напалеонам I і Аляксандрам I, якія хацелі выкарыстаць яго імя дзеля сваіх інтарэсаў. Памёр у Салюры (кантон Золатурн, Швейцарыя). Прах К. перавезены ў Кракаў. Там пастаўлены помнік К. Яго імем названа 1-я дывізія Войска Польскага, што з Сав. Арміяй удзельнічала ў вызваленні Польшчы ад гітлераўцаў. У ЗША помнікі К. ў Вашынгтоне, Чыкага, Кліўлендзе і Мілуоках, у штаце Місісіпі невялікі горад (больш за 6 тыс. чал.) названы яго імем.

Тв.: Рус. пер.— у кн.: Избранные произведения прогрессивных польских мыслителей, т. 1, М., 1956, с. 493—584.

Літ.: Островер Л. И. Тадеуш Костюшко, М., 1961; Dihm J. Kościuszko nieznany, Wrocław — Warszawa — Kraków, 1969; Tadeusz Kościuszko w historii i tradycji, Warszawa, 1968.

А. П. Грыцкевіч. Мінск.

КАСЦЮШКА Іван Іванавіч (н. 31.7.1919, аколіца Букарава Аршанскага пав. Гомельскай губ.), савецкі гісторык. Д-р гістар. н. (1963). З сялян. Чл. КПСС з 1943. Скончыў Маскоўскі гісторыка-архіўны ін-т (1947). Удзельнік Айч. вайны. З 1947 навук. супрацоўнік ЦДАКР БССР. З 1949 у Ін-це славяназнаўства АН СССР (навук. супрацоўнік, з 1970 заг. сектара). Адначасова (з 1965) галоўны рэдактар часопіса «Советское славяноведение». Асноўныя навуковыя працы па новай і навейшай гісторыі Польшчы. Адзін з аўтараў 3-томнай «Гісторыі Польшчы» (т. 2—3, 1955—58). Узнагароджаны 2 ордэнамі ПНР, медалямі.

Тв.: Крестьянская реформа 1864 года в Царстве Польском, М., 1962.

КАСЦЮШКА-ВАЛЮЖАНІЧ Антон Антонавіч [парт. псеўд. Грыгаровіч; 16(28).6.1878, Казань — 2(15).3.1906], актыўны ўдзельнік рэвалюцыі 1905—07. З сям'і афіцэра, па паходжанні беларус. Чл. РСДРП з 1900. Скончыў Паўлаўскае афіцэрскае вучылішча ў Пецярбурзе (1896). За рэвалюц. дзейнасць выключаны з Нова-Александрыйскага с.-г. ін-та, з Екацярынаслаўскага выш. горнага вучылішча. У 1900—01 чл. Екацярынаслаўскага к-та РСДРП. Быў у турмах і ў ссылцы. У пач. 1905 ваенны кіраўнік паўстання паліт. ссыльных у Якуцку. У 1905—06 з І. В. Бабушкіным і В. К. Курнатоўскім уваходзіў у Чыцінскі к-т РСДРП(б), ваенны кіраўнік «Чыцінскай рэспублікі». Расстраляны карнай экспедыцыяй. Імем К.-В. названа вуліца ў Чыце.

Літ.: Ольхон А. С. Большевик Костюшко-Валюжанич, [Иркутск], 1949; Гуро И. Р. Подвиг Антона Костюшко, М., 1964.

М. Ф. Мельнікаў. Крычаў.

КАСЦЮШКАВІЧЫ, вёска ў Крычаўскім р-не Магілёўскай вобл., на р. Добрасць. Цэнтр сельсавета і калгаса «Памяць Леніна». За 9 *км* на З ад Крычава, 113 *км* ад Магілёва, 14 *км* ад чыг. ст. Крычаў 1-ы. 276 ж., двароў 91 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Пач. школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі, магазін. У вер. 1943 вёску спалілі ням.-фаш. захопнікі.

КАСЦЮШКІ, шляхецкі род беларускага паходжання. Вядомы з 15 ст. У 1458 кароль Рэчы Паспалітай Казімір IV падараваў Фёдару К. вёску Сяхновічы (з 1940 Жабінкаўскі р-н), таму род часта звацца К.-Сяхновіцкія. Пазней род К. рассяліўся ў Гродзенскім пав. і Мсціслаўскім ваяводстве.

Найб. вядомыя з роду К.: Андрэй, палкоўнік войска Вял. кн. Літ.; Павел, пісар, падкаморы брэсцкі; Міхалай, ротмістр, дэпутат сейма ад Навагрудчыны; Пётр, дэпутат сейма ад Пінскага пав.; Казімір, стольнік, староста вендзенскі; Адам Казімір (п. пасля 1729), мечнік і падчашы інфлянцкі, староста эзельборскі, вышэйшы саветнік Курляндскага герцагства, прыхільнік ідэі далучэння Курляндыі да Рэчы Паспалітай; Уладзіслаў, стольнік пінскі, староста жытомірскі; Людвік (п. каля 1758), мечнік Брэсцкага ваяводства, палкоўнік войска Вял. кн. Літ., бацька Т. Касцюшкі; Фаўстын Вянядзікт (1672—1755), кіеўскі харунжы; Ян Непамуцэн (каля 1720 — пасля 1788), харунжы Кіеўскага ваяводства, апякун Т. Касцюшкі, з 1764 мечнік оўруцкі, з 1766 пісар земскі жытомірскі, з 1769 люблінскі саветнік Барскай канфедэрацыі, пасля паражэння якой эмігравaў у Венгрыю; Андрэй Тадэвуш (1746—1817), кіраўнік нац.-вызв. паўстання 1794 (гл. *Касцюшка* Т.). Дваранства К. пацверджана ў Расіі ў 1852.

А. П. Грыцкевіч. Мінск.

КАСЦЯВАЯ МУКА, абястлушчаныя, абясклееныя і перамолатыя косці жывёл. К. м. мае фосфар і кальцый. Ідзе на корм жывёле, павінна мець не менш як 13,1% фосфару (30% P_2O_5) і 28,6% кальцыю (40% CaO). Выкарыстоўвалася як фосфарнае ўгнаенне.

Літ.: Олль Ю. К. Минеральное питание животных в различных природно-хозяйственных условиях, Л., 1967.

КАСЦЯВЫ МОЗГ, тканка, якая напаўняе губчатае рэчыва і поласці касцей у названочных жывёл і чалавека. Маса яго ў дарослага чалавека да 3700 *г* (3,4—5,9% ад усёй масы цела). Складаецца з рэтыкулярнай тканкі, крывятворных і тлушчавых клетак. Забяспечаны першымі і крывяноснымі сасудамі. Адрозніваюць чырвоны К. м. (яму належыць гал. роля ў кроваўтварэнні) і жоўты К. м. (пераважна ўдзельнічае ў тлушчавым абмене).

У касцях дзяцей да 7 г. пераважае чырвоны К. м. Ва ўзросце 18—20 г. у дыяфізах трубчастых касцей ён заменьваецца жоўтым К. м. Спелыя клеткі крыві з К. м. праз сценку сінусоідных капілляраў паступаюць у крывяносную сістэму. Паляданне ў крыві няспелых клетак бывае пры парушэнні кроваўтварэння. К. м. мае ахоўную функцыю (ретыкулярныя клеткі і клеткі эндатэлію сінусоідных капілляраў здольныя захопліваць іншародныя часткі з крыві і станавіцца макрафагамі). Даследаванне К. м. дае неабходныя звесткі для дыягностыкі і лячэння хвароб крыві (асабліва лейкозаў), злаякасных утварэнняў, многіх паразітарных інфекцый, прамянёвай хваробы, злаякаснага малакроўя. З дапамогай клетак К. м., узятых ад донара, лечаць ад прамянёвай хваробы, анеміі, лейкозаў і інш.

Літ.: Кассирский И. А. и Алексеев Г. А. Клиническая гематология, 4 изд., М., 1970; Сейц И. Ф. и Луганова И. С. Биохимия клеток крови и костного мозга в норме и при лейкозах, Л., 1967.

Я. П. Іваноў. Мінск.

КАСЦЯНЁВІЧЫ, вёска ў Вілейскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 24 *км* на ПнУ ад Вілейкі, 127 *км* ад Мінска, 10 *км* ад чыг. раз'езда Стражы, на аўтамаб. дарозе Вілейка — Докшыцы. 269 ж., двароў 79 (1971). Камбінат бытавога абслугоўвання, лясніцтва. Сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, бальніца, аптэка, ветэрынарны пункт, аддзяленне сувязі, сталовая, 3 магазіны. Помнік і мемарыяльная дошка на ўшанаванне памяці 52 землякоў, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

КАСЦЯНЁВА, вёска ў Шчучынскім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 18 *км* на ПнУ ад Шчучына, 86 *км* ад Гродна, 15 *км* ад чыг. ст. Скрыбаўцы, каля аўтамаб. дарогі г. п. Жалудок — в. Матылі (3 *км*). 411 ж., гасп. 135 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, вет. пункт, магазін.

КАСЦЯНЁЎКА, рака, правы прыток р. Лебяды (бас. Нёмана). Даўж. 21 *км*. Цячэ ў Шчучынскім р-не Гродзенскай вобл. Вадазбор (98 $км^2$) — слаба хвалістая, забалочаная і аблесеная раўніна. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 0,6 $м^3/сек$. К.— водапрыёмнік пры асушэнні балотаў.

КАСЦЯНІ, вёска ў Азгінавіцкім с/с Слонімскага р-на. Цэнтр калгаса «Дружба». За 7 *км* на ПдЗ ад Слоніма, 172 *км* ад Гродна, каля аўтамаб. дарогі Слонім — Пружаны (2 *км*). 424 ж., гасп. 126 (1971). Швейная майстэрня. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, дзіцячыя яслі-сад, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Помнік на брацкай магіле 546 сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны.

КАСЦЯНІЦЫ (Rubus saxatilis), шматгадовая травяністая расліна сям. ружакветных. Расце ў лясах умераных зон Еўропы і Азіі, на Беларусі — усюды. Плады ядомыя, багатыя на цукар, арган. к-ты. Ужываюцца свежыя і перапрацаваныя.

Расліна выш. 10—30 *см*, укрытая шчацінкамі. Ад карэнішча адыходзяць прамастойныя пладаносныя сцяблы і доўгія паўзучыя бясплодныя парасткі. Лісце трайчастае. Кветкі белыя, сабраныя ў шчыткападобныя суквецці. Плод — зборная касцянка з ярка-чырвоных сакаўных кіслых плодзікаў.

Літ.: Рыбицкий Н. А. и Гаврилов И. С. Дикорастущие плоды и ягоды, Л., 1969.



Касцяніцы: *1* — агульны выгляд расліны; *2* — плод.

КАСЫГІН Аляксей Мікалаевіч [н. 8(21).2.1904, Пецярбург], дзеяч Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы, Старшыня Савета Міністраў СССР, чл. Палітбюро ЦК КПСС. Герой Сац. Працы (1964). З сям'і рабочага-токара. Чл. КПСС з 1927.



У 1919 добраахвотна пайшоў у Чырв. Армію. У 1921—24 вучыўся ў Ленінградскім каап. тэхнікуме, пасля скончэння якога накіраваны ў Новасібірск. Шэсць гадоў працаваў у сістэме спажывецкай кааперацыі Сібіры — інструктар Абласнога саюза, чл. праўлення Ленскага саюза, заг. планавага аддзела Сібірскага краявога саюза. З 1930 вучыўся ў Ленінградскім тэкст. ін-це імя Кірава, пасля скончэння якога з 1935 у Ленінградзе на тэкст. ф-цы імя Жалябава — майстар, нач. цэха. У 1937 дырэктар Кастрычніцкай прадзільна-ткацкай ф-кі ў Ленінградзе. Як член Выбаргскага райкома ВКП(б) актыўна ўдзельнічаў у рабоце Выбаргскай парт. арганізацыі. З ліп. 1938 на парт. і сав. рабоце ў Ленінградзе — заг. прамысл.-трансп. аддзела абкома партыі, старшыня выканкома Ленінградскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных. З студз. 1939 нарком тэкст. прамысловасці СССР. У 1940—46 нам. старшыні СНК СССР. З 1943 да 1946 адначасова старшыня СНК РСФСР. У Айч. вайну выконваў важныя дзярж. заданні як нам. старшыні Савета па эвакуацыі з небяспечных раёнаў краіны насельніцтва, прамысл. прадпрыемстваў і матэрыяльных рэсурсаў, ажыццяўляў захады для хутчэйшага аднаўлення эвакуіраваных ф-к і з-даў.

У пасляваенныя гады нам. Старшыні Савета Міністраў СССР (да сак. 1953), адначасова ў 1948 міністр фінансаў СССР, у 1949—53 міністр лёгкай прамысловасці СССР. З перайменаваннем міністэрстваў СССР у 1953 міністр лёгкай і харч. прамысловасці, потым узначальваў Мін-ва прамысл. тавараў

шырокага спажывання СССР, з снеж. 1953 адначасова нам. Старшыні Савета Міністраў СССР. З лютага 1954 да снеж. 1956 А. М. Касыгін сканцэнтраваў сваю дзейнасць на пасадзе нам. Старшыні Савета Міністраў СССР. У снеж. 1956 прызначаецца першым нам. старшыні Дзярж. эканам. камісіі Савета Міністраў СССР па бягучым планаванні нар. гасп., міністрам СССР. З мая да ліп. 1957 першы нам. старшыні Дзяржплана СССР. З ліп. 1957 нам. Старшыні Савета Міністраў СССР і ў 1959—60 адначасова старшыня Дзяржплана СССР. З 1960 першы нам. Старшыні Савета Міністраў СССР. З кастр. 1964 Старшыня Савета Міністраў СССР.

Глыбокія інж. і эканам. веды, вялікі вопыт дзярж. работы, высокія арганізатарскія здольнасці А. М. Касыгіна яшчэ больш выявіліся на пасадзе кіраўніка Сав. ўрада. Ён выдатны эканаміст з шырокім тэарэт. дыяпазонам. Непасрэдна кіраваў распрацоўкай прапаноў па ажыццяўленні ленінскіх прынцыпаў гаспадарання на новым этапе камуніст. буд-ва, зрабіў вялікі ўклад ва ўдасканаленне планавання сацыяліст. эканомікі і кіравання ёю. На XXIII з'ездзе КПСС выступіў з дакладам «Дырэктывы XXIII з'езду КПСС па пяцігадовым плане развіцця народнай гаспадаркі на 1966—1970 гады»; на XXIV з'ездзе — «Дырэктывы XXIV з'езду КПСС па пяцігадовым плане развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1971—1975 гады». Па дакладзе А. М. Касыгіна на вераснёўскім Пленуме ЦК КПСС (1965) прынята пастанова «Аб паляпшэнні кіравання прамысловасцю, удасканальванні планавання і ўзмацненні эканамічнага стымулявання прамысловай вытворчасці». У якасці кіраўніка Сав. ўрада бесперапынна праводзіць лінію партыі па ажыццяўленні ленінскай палітыкі мірнага суіснавання, робіць вялікі ўклад у справу далейшага ўмацавання і развіцця паліт. і эканам. супрацоўніцтва краін сусветнай сістэмы сацыялізма. Неаднаразова ўзначальваў сав. парт.-ўрадавыя дэлегацыі ў многія дзяржавы свету.

На XVIII—XXIV з'ездах КПСС выбіраўся чл. ЦК. У 1946—48 канд. у чл. Палітбюро, у 1948—52 чл. Палітбюро ЦК ВКП(б). У 1952—53, 1957—60 быў выбраны канд. у чл. Прэзідыума ЦК КПСС, з 1960 чл. Прэзідыума ЦК КПСС, з 1966 чл. Палітбюро ЦК КПСС. Дэп. Вярх. Савета СССР 2—8-га скл. Узнаг. 4 ордэнамі Леніна, ордэнам Чырв. Сцяга, медалямі.

КАСЬЯНАЎ Стафан Іванавіч [н. 27.12.1903 (9.1.1904), в. Нова-Беліца Гомельскага пав. Магілёўскай губ.], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Гомельскай вобл. ў Айч. вайну. З рабочых. Чл. КПСС з 1924. Скончыў Маскоўскі ін-т нар. гасп. імя Пляханава (1936). З 1937 на парт., сав. і пед. рабоце ў Гомельскай вобл. З 1940 сакратар Навабеліцкага райкома КП(б)Б. У партызанах з жн. 1941 — радавы, камандзір аддзялення, узвода; з вер. 1943 камісар *партызанскай брыгады імя В. І. Чапаева* Гомельскай вобл. З лютага да ліст. 1943 сакратар Буда-Кашалёўскага падпольнага райкома КП(б)Б. Пасля вайны першы сакратар Навабеліцкага, Лёзненскага райкомаў КП(б)Б. З 1948 на прафс., гасп. рабоце ў Гомельскай вобл. Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі. Жыве ў Гомелі.

КАСЯК Іван Раманавіч (22.4.1922, с. Булахаўка Паўлаградскага пав. Екацярынаслаўскай губ.— 12.2.1971), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). Чл. КПСС з 1943. На фронце з 1941. Вызначыўся ў Гомельскай вобл. У кастр. 1943 першы на чале аддзялення фарсіраваў Дняпро каля Лоева, выбіў ворага з траншэі, захапіў 2 кулямёты, з якіх вёў агонь па ворагу і гэтым садзейнічаў замацаванню на плацдарме.

КАСЯК Марыя Іванаўна [н. 2(15).1.1918, в. Заазер'е Вілейскага пав. Віленскай губ.], перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1965. У 1949—53 палявод, з 1953 звеннявая па вырошчванні лёну ў калгасе «Чырвоны сцяг» Вілейскага р-на Мінскай вобл. Дэп. Вярх. Савета БССР 6-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Кастр. Рэвалюцыі, медалямі.

КАСЯНІЧЫ, вёска ў Абчугскім с/с Крупскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр саўгаса «Касянічы». За 42 *км* на ПнУ ад Крупак, 160 *км* ад Мінска, 37 *км* ад чыг. ст. Бобр. 686 ж., двароў 238 (1971). Філіял раённага камбіната быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, 2 магазіны. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. У 1944 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі.

КАСЯНЧУК Пётр Якаўлевіч [12(25).4.1902, в. Буда-Валчкоўская Кіеўскай губ.— 21.1.1945], кавалер ордэнаў Славы трох ступеняў. Беларус. З сялян. Чл. КПСС з 1941. З 1930 у саўгасе «Ялава» Чавускага р-на Магілёўскай вобл. Удзельнік сав.-фінляндскай вайны 1939—40. У Айч. вайну з 1941 на Зах. і 2-м Бел. франтах — сержант, камандзір сапёрнага аддз. стралк. палка. Двойчы вызначыўся на Беларусі і 21.1.1945 у Польшчы. Памёр ад ран.

КАТАБАЛІЗМ, працэс распаду арганічных рэчываў у арганізме, тое, што *дысіміляцыя*.

КАТАВІЧЫ, вёска ў Якубаўскім с/с Воранаўскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса «1 Мая». За 65 *км* на ПдЗ ад Воранава, 68 *км* ад Гродна, 27 *км* ад чыг. ст. Скрыбаўцы. 202 ж., двароў 63 (1971). Клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін.

КАТАЕЎ Валянцін Пятровіч [н. 16(28).1.1897, Адэса], рускі савецкі пісьменнік. Чл. КПСС з 1958. Сын настаўніка. Удзельнік 1-й сусв. і грамадз. войнаў; у Айч. вайну карэспандэнт «Правды» і «Красной Звезды». У 1955—62 гал. рэдактар час. «Юность». Друкуецца з 1910. Апавяд. 20-х г., аповесць «Растратчыкі» (1926) прасякнуты пафасам



сатыр. адмаўлення старога свету, псіхалогіі ўласніцтва. Раман-хроніка «Час, наперад!» (1932) пра сацыяліст. будаўніцтва. Аповесць «Бялее ветразь адзінокі» (1936, спектакль паводле яе паст. Бел. т-рам юнага гледача ў 1970) пачынае тэтралогію на гісторыка-рэвалюц. тэму «Хвалі Чорнага мора» («Хутарок у стэпе», 1956; «Зімовы вецер», 1960; «Катакомбы», 1961). Аўтар аповесці пра У. І. Леніна «Маленькія жалезныя дзверы ў сцяне» (1964), лірыка-філас. аповесцей «Святы калодзеж» (1966), «Трава забыцця» (1967), п'ес («Авангард», 1929, паст. т-ра імя Я. Коласа 1930; «Квадратура круга», 1928, паст. т-ра імя Я. Коласа 1958), кн. нарысаў «Па Заходняй Беларусі» (1939). Спалучэнне гераічнай патэтыкі і сатыры, лірыкі і гумару — асаблівасці творчай манеры К. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, ордэнам Кастр. Рэвалюцыі, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.

Тв.: Собр. соч., т. 1—9, М., 1968—71; бел. пер.— Сон. Апавяданне, Мн., 1938; Я, сын працоўнага народа, Мн., 1938; Сын палка, Мн., 1947; Бялее ветразь адзінокі, Мн., 1949.

Літ.: Брайнина Б. Валентин Катаев, М., 1960; Скорино Л. Писатель и его время, М., 1965.

А. Р. Жакаў. Мінск.

КАТАЕЎ Віталь Віталевіч (н. 23.12.1925, Вятка), беларускі савецкі дырыжор. Засл. арт. БССР (1966). Скончыў Маск. кансерваторыю (1956). У 1956—59 дырыжор сімф. аркестра Карэльскага радыё, у 1960—62 выкладчык Муз.-пед. ін-та імя Гнесіных (Масква), у 1962—71 гал. дырыжор Дзярж. сімф. аркестра БССР і выкладчык Бел. кансерваторыі. У канцэртнай дзейнасці значную ўвагу аддаваў сучаснай сав. і замежнай музыцы. Інтэрпрэтатар многіх бел. твораў (Л. Абеліёвіча, М. Аладава, А. Багатырова, Я. Глебава, Дз. Камінскага і інш.).

КАТАЕЎ Міхаіл Максімавіч [8(21).12.1903, с. Асмярыжска Паўладарскага пав. Сяміпалацінскай вобл.— 26.1.1944], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). На фронце з 1941. Вызначыўся ў Камарынскім р-не Палескай вобл. У ноч на 26.9.1944 з трыма разлікамі ПТР першы фарсіраваў Дняпро, закідаў гранатамі варожыя траншэі. Асабістай мужнасцю даў прыклад паспяхова пераправіцца цераз раку ўсёй часці. Загінуў у баі. Пахаваны ў Мазыры. Яго імем названа вуліца ў Мазыры.

КАТАКЛАЗ (ад грэч. katakláso разбураю), драбленне горнай пароды ці асобных яе мінералаў у выніку тэктанічных працэсаў. Пры К. парушаюцца міжатамныя і міжмалекулярныя сувязі з разбурэннем крышталь. рашоткі ўздоўж пэўных паверхняў (шчылін), узнікаюць характэрныя горныя пароды — катаклазіты. З зонамі К. часта звязаны паклады карысных выкапняў.

КАТАКОМБАВАЯ КУЛЬТУРА, археал. культура плямёнаў бронзавага веку, якія ў канцы 3—1-й пал. 2-га тысячагоддзя да н. э. жылі паміж Дняпром і Волгай, пазней — у Прыазоўі, Крыме, на Паўн. Каўказе. Выдзелена В. А. Гарадцовым у пач. 20 ст. Назва ад пахавальнага абраду: нябожчыкаў хавалі ў катакомбах — падбоях, выкапаных у сценах магільных ям, скурчанымі, на баку, пасыпалі чырв. фарбай, побач клалі посуд, прылады працы, зброю. У курганах і на паселішчах трапляецца гліняны пласкадонны посуд, аздоблены шнуравым арнаментам, каменныя сякеры, булавы, наканечнікі стрэлаў, бронзавыя кінжалы, сякеры, долаты. Насельніцтва займалася жывёлагадоўляй, матычным земляробствам, бронзаліцейнай вытворчасцю. У плямёнаў К. к. складваўся бацькоўскі род. Ёсць звесткі пра існаванне патрыярхальнага рабства.

Літ.: Авдусин Д. А. Археология СССР, М., 1967.

КАТАКОМБЫ (позналац. catacumba), падземныя памяшканні прыроднага або штучнага паходжання. Выкарыстоўваліся пераважна для рэліг. абрадаў і пахаванняў. Вядомы К. ў Рыме (лабірынты вузкіх галерэй даўж. каля 900 *км* з невялікімі заламі), Неапалі, Паўн. Афрыцы і інш. Звычайна ўпрыгожваліся роспісам. К. называюць і занядбаныя падземныя каменяломні. К. Адэсы, Керчы выкарыстоўваліся ў рэвалюц. і партызанскай барацьбе.

КАТАЛАЎНСКІЯ ПАЛІ (лац. Campi Catalaunici), раўніна ў Паўн.-Усх. Францыі (каля г. Каталаунум, сучасны Шалон-на-Марне), дзе ў чэрв. 451 адбылася т. зв. «бітва народаў» — бітва рымскіх войск на чале з палкаводцам Аэцыем і іх саюзнікаў (вестготаў, бургундаў, франкаў, аланаў і інш.) супраць аб'яднаных сіл гунаў з остготамі, гепідамі і інш. плямёнамі. Рымляне і вестготы разбілі этнічна неаднароднае войска гунаў. Бітва на К. п. спыніла нашэсце гунаў у Зах. Еўропу.

Кр.: Иордан. О происхождении и деяниях гетов. Getica, пер. с лат., М., 1960.

КАТАЛІЗ (грэч. katálysis разбурэнне), змена (звычайна павелічэнне) скорасці хімічнай рэакцыі з дапамогай спец. рэчываў (каталізатараў). Пры К. рэчывы, што рэагуюць, і каталізатар утвараюць нетрывалыя прамежкавыя злучэнні, якія хутка ператвараюцца ў канечныя прадукты рэакцыі з вызваленнем каталізатара, які здольны зноў уступаць у рэакцыю.

Адрозніваюць гамагенны і гетэрагенны К. Пры гамагенным К. каталізатар і рэчывы рэакцыі ўтвараюць аднародную сістэму (напр., гідратацыя этылену ў спірт ад дзеяння сернай к-ты). Пры гетэрагенным К.— неаднародную (напр., атрыманне аміяку з вадароду і азоту ў прысутнасці каталізатара з адноўленага жалеза). Дзякуючы К. адбываюцца многія працэсы ў жывёльным і раслінным свеце: страваванне, сінтэз бялкоў, ператварэнне хім. энергіі ў мускульную. Каталізатары гэтых працэсаў — бялковыя *ферменты*, актыўнасць якіх звычайна ў шмат разоў большая, чым у прамысл. каталізатараў. К. дае магчымасць без дадатковых затрат энергіі і матэрыялаў атрымліваць неабходныя хім. рэчывы. На Беларусі каталітычныя працэсы выкарыстоўваюцца пры сінтэзе аміяку, у вытворчасці сернай к-ты шляхам акіслення сярністага газу (ванадыевы каталізатар), для здабычы высокаактанавага бензіну (плацінавы каталізатар) і інш. Гл. таксама *Інгібітары*.

Літ.: Ферменты, М., 1964; Ерофеев Б. В. Переходные металлы и их каталитические свойства, М., 1966; Панченков Г. М. и Лебедев В. П. Химическая кинетика и катализ, М., 1961; Томас Дж. и Томас У. Гетерогенный катализ, пер. с англ., М., 1969.

КАТАЛІЦЫЗМ, рымская апосталіцкая каталіцкая царква (ад лац. catholicismus усеагульны, галоўны), адзін з найбольш пашыраных побач з *праваслаўем* і *пратэстантызмам* кірункаў у *хрысціянстве*. К.— рэліг., маральная і сац.-паліт. дактрына каталіцкай царквы.

Фарміраванне К. пачалося ў сувязі з падзелам у 395 Рымскай імперыі на Заходнюю і Усходнюю і закончылася ў 1054 падзелам хрысц. царквы на заходнюю і ўсходнюю. К. быў пануючай рэлігіяй феад. грамадства ў краінах Зах. Еўропы. Паступова пристасаваўся да ўмоў бурж. грамадства і ператварыўся ў духоўны сродак умацавання ўлады капіталу. Паводле звестак бурж. рэлігіязнаўства на свеце 580,5 млн. католікаў. Сац.-дагматычная аснова К.— ідэя іерархіі (улады духавенства), якая прыкрываецца вучэннем пра тэакратыю (літар. богаўладдзе). На чале каталіцкай царквы — папа рымскі, адначасова і неабмежаваны правіцель *Ватыкана*. Асн. догматы К.: траістасць адзінага бога, боскасць *Хрыста*, падзенне чалавека з-за першароднага граху, выратаванне чалавека праз смерць Хрыста. У адрозненне ад праваслаўя К. прызнае, што дух святы зыходзіць не толькі ад бога-бацькі, але і ад бога-сына, што існуе чысцец (акрамя пекла і раю). У адрозненне ад пратэстантызму прызнае крыніцаю веравучэння не толькі *Біблію* («пісанне»), але і «традыцыю» («паданне») — вусныя апавяданні, якія нібыта дайшлі праз апосталаў і айцоў царквы, рашэнні царк. сабораў, пасланні папаў і інш. Асн. дагматычная асаблівасць К.— прызнанне бязгрэшнасці папы ў справах веры і маралі, якога К. лічыць намеснікам Хрыста на зямлі. К. ўласціва асаблівае шанаванне «багародзіцы» дзевы Марыі, пышны тэатралізаваны культ, які выкарыстоўвае ўсе віды мастацтва, каб уздзейнічаць на веруючых. Каталіцкае духавенства дае абяцанне бясшлюбнасці — целібат. Філас.-тэалагічная аснова К.— аўгусцініянства (да 13 ст.), тамізм (з 14 ст.) і *неатамізм* (з 1879), які абвешчаны афіц. філас. дактрынаю К. Яму ўласціва нецярпімасць да інш. рэлігій, у т. л. і да хрысц. вераызнанняў, жорсткае праследаванне ерэтыкоў, інавернцаў і атэістаў (гл. *Ерась, Місіянерства, Інквізіцыя, Крыжовыя паходы*). Каталіцкая царква была арганізатарам крывавых распраў з нар. паўстаннямі ў Францыі, Чэхіі і інш. (гл. *Альбігойскія войны, Гусіцкі рэвалюцыйны рух*), крыжовых паходаў на У 11—13 ст. Уплыў К. на Беларусі пашырыўся з часоў *Крэўскай уніі 1385, Гарадзельскай уніі 1413*. Праваднікамі каталіцкага ўплыву на Беларусі былі манашскія ордэны (*езуіты, дамініканцы, францысканцы* і інш.). У 17 ст. польская шляхта выкарыстоўвала К. для заняволення бел. народа (гл. *Брэсцкая унія 1596*). Станоўчую ролю ў барацьбе бел. народа супраць экспансіі каталіцкай царквы адыгралі *брацтвы*. Толькі пасля 2-й сусв. вайны ва ўмовах паглыблення крызісу К. яго лідэры ўзялі курс на міжрэлігійнае супрацоўніцтва (экуменізм), імкнучыся выкарыстаць яго для процідзеяння ўплыву атэізму. Пасля *Рэфармацыі* 16 ст. ад К. адпалі царквы ў Англіі, Шатландыі, Швецыі, Галандыі, частцы Германіі, у Швейцарыі і інш.

Побач з царкоўнымі К. мае і свецкія арганізацыі — паліт. партыі, прафсаюзныя, маладзёжныя, жаночыя і інш. аб'яднанні — праваднікі рэліг. і бурж. ўплыву на працоўных (гл. *Клерыкалізм*). Сучаснаму К. характэрна глыбокая сац.-паліт. дыферэнцыяцыя. Разам з «інтэгрыстамі», што адстойваюць права царквы мець перавагу над усімі праявамі грамадскага жыцця і адкрыта прытрымліваюцца пазіцый антыкамунізму, у ім ёсць уплывовыя групы т. зв. «прагрэсістаў», якія выступаюць за сац. абнаўленне бурж. грамадства, за дыялог з марксістамі. Глыбіню крызісу і супярэчнасцей К. прадэманстравалі 2-і Ватыканскі ўсяленскі сабор (гл. *Ватыканскія саборы*) і паслясаборны перыяд. У СССР К. мае паслядоўнікаў у Літве, Латвіі, на Беларусі і Украіне.

Літ.: Энгельс Ф. Крестьянская война в Германии; Маркс К. и Энгельс Ф. Соч., т. 7; Ленин В. И. О религии и церкви, М., 1966; Мчедлов М. П. Эволюция современного католицизма, М., 1967; Ярго ж. Католицизм, М., 1970; Бабосов Е. М. Современный католицизм и наука, Мн., 1964; Ярго ж. Научно-техническая революция и модернизация католицизма, Мн., 1971; Мараш Я. Н. Ватикан и католическая церковь в Белоруссии, Мн., 1971. *Я. М. Бабосаў.* Мінск.

КАТАЛОГ (грэч. katálogos спіс), пералік зорак, прадметаў (кніг, рукапісаў, музейных экспанатаў, дэталяў машын, абсталявання і інш.), падабраных па пэўных адзнаках; складаецца ў вызначаным парадку, каб іх лягчэй было знайсці. Афармляюцца К. ў выглядзе картак, кніг, альбомаў. Больш вядомыя К. бібліятэчныя. Па прыналежнасці падзяляюць на чытальніцкі і службовы, па структуры — на алфавітны, сістэматычны, прадметны, нумарацыйны і інш., па ахопе фонду — на генеральны, спецыяльны, зводны. Гл. таксама *Зорныя каталогі*.

Літ.: Библиотечные каталоги, М., 1967.

КАТАЛЬПА (Catalpa), род лістападных дрэў сям. бігноніевых. Вядома 10 відаў, пашыраных у Паўн. Амерыцы, Японіі, Кітаі. У паўд. р-нах СССР культывуюцца як дэкар. 4 віды. На Беларусі выпрабаваныя К. бігноніепадобная (C. bignonioides), К. прыгожая (C. speciosa), К. японская (C. ovata) і К. Бунге (C. bungei).



Катальпа бігноніепадобная: галінка з кветкамі і лісцем.

Хуткарослыя дрэвы, выш. да 30 *м*. Лісце вялікае, сэрцападобнае. Кветкі белыя з жаўтаватымі палоскамі і чырв. кропкамі, сабраныя ў вялікія гронкі. Плод — цыліндрычная каробачка. Размнажаюцца насеннем. К. можа вырошчвацца як дэкар. дрэва толькі ў паўд.-зах. р-нах БССР.

Літ.: Гл. пры арт. *Дэкаратыўныя расліны*.

КАТАМАРАН, параснае ці маторнае судна з двух вузкіх доўгіх карпусоў, якія знаходзяцца на пэўнай адлегласці адзін ад аднаго і звязаны агульнай палубай. Мае меншае супраціўленне вады пры руху, чым звычайнае судна, і гэта павялічвае яго скорасць. Форму К. звычайна надаюць невялікім спарт. суднам, катэрам.



КАТАНГЕНС, адна з *трыганаметрычных функцый*, вызначаецца як $\operatorname{ctg} x = \frac{\cos x}{\sin x}$, дзе x — аргумент.

КАТАПУЛЬТА (лац. catapulta), 1) ваенная кідальная машына, якою карысталіся пры асадзе крэпасцяў; кідала камяні, бочкі з гаручым на некалькі соцень метраў (іл. гл. пры арт. *Кідальная зброя*). 2) Механізм для старту самалётаў з палубы авіяносца. 3) Прыстасаванне для аўтам. выкідвання лётчыка з самалёта ў час аварыі; К. наземная — стэнд для трэніроўкі лётчыкаў і касманаўтаў; крэсла касманаўта, якое мае прыстасаванне для катапультавання з кабіны і наступнага спуску на парашуце. Катапультаванне касманаўтаў перад прызямленнем (на выш. некалькіх кіламетраў) прадугледжваецца ў некаторых схемах пасадкі касмічных карабляў.

КАТАР, дзяржава на ўсходзе Аравійскага п-ва (п-аў Катар). Плошча каля 22 тыс. *км*², насельніцтва 100 тыс. чал. (1969). Сталіца Доха. К.— абсалютная манархія. Дзейнічае часовая канстытуцыя 1970. На чале дзяржавы шэйх. Выканаўчую ўладу ажыццяўляе ўрад, які ўзначальвае шэйх. Амаль увесь п-аў займае вапняковае плато. Краіна багатая на нафту (запасы 500 млн. *т*, 1968). Клімат сухі, пустынны. Сярэдняя т-ра студз. каля 16, ліп. 32—34 °С. Ападкаў каля 100 *мм* за год. Жывуць арабы, ёсць іранцы, афрыканцы і інш. Дзярж. мова — арабская. Большасць веруючых — мусульмане. Гарадскога нас. каля 80%.

К. упершыню апісаны Плініем Старэйшым (1 ст. н. э.). Быў у складзе дзяржавы Сасанідаў, у 7—13 ст. пад уладаю арабаў і карматаў, з 13 ст.— эмірат Бахрэйна. У 16 ст. захоплены партугальцамі, у канцы 16 ст.— туркамі-асманамі. Залежаў ад Ірана, аравійскіх плямёнаў Бандуназіл, Кувейта, Амана, вахабітаў, Турцыі (17—19 ст.). У 1882 фактычна стаў англ. пратэктаратам (у 1916 урад К. афіцыйна прызнаў пратэктарат). У 30-я г. ў К. знойдзена нафта. Барацьба народа К. за незалежнасць актывізавалася пасля 2-й сусв. вайны. 1.9.1971 абвешчаны незалежным. Паліт. партый у краіне няма.

К.— адсталая краіна. Гал. ролю ў эканоміцы адыгрывае здабыча нафты, якую вядуць 3 замежныя кампаніі, пераважна з амер. і англ. капіталам (17,6 млн. *т*, 1970). Амаль уся нафта экспартуецца; на нафтаперапр. з-дзе ў Ум-Саідзе перапрацоўваецца 30 тыс. *т* за год. ЦЭС і апрасняльная ўстаноўка ў г. Доха, цементавы з-д у Ум-Бабе. Невялікія майстэрні па вытворчасці буд. матэрыялаў, мэблі, дываноў, харч. тавараў. Асн. заняткі насельніцтва — с. гасп., рыбалоўства, здабыча жэмчугу і каралаў. У с. гасп. пануюць феад. адносіны. Вырошчваюць фінікі, агародніну (каля 15—20 тыс. *т* штогод), люцэрну. Гадуюць пераважна коз і авечак. Гал. парты: Ум-Саід і Доха. К. вывозіць нафту, прывозіць абсталяванне, прамысл. і харч. тавары. Грашовая адзінка — рыял Катара і Дубаі.

Літ.: Водянский В. Л., Герасимов О. Г. и Медведко Л. И. Княжества Персидского залива, М., 1970.

КАТАРАКТА (грэч. katarrhaktés вадаспад), хвароба вачэй, якая характарызуецца памутненнем крышталіка. Бывае прыроджаная і набытая.

Прыроджаная К. звычайна не большае ў памерах (К., не здольная прагрэсіраваць), размяшчаецца ў цэнтры (на полюсе) пярэдняй або задняй наверхні крышталіка ці ў яго асобных слаях. Найчасцей бывае набытая, пры якой памутненне паступова павялічваецца да поўнай непразрыстасці крышталіка (К., здольная прагрэсіраваць). Спрыяюць развіццю набытай К. парушэнне абмену вітамінаў (пераважна C, B_2) ва ўзросце 50—60 гадоў (старэчая К.), прафес. шкоднасці, мех. пашкоджанні, фіз. фактары, агульныя хваробы арганізма, паталагічныя працэсы ў воку. К. панікае зрок, можа быць прычынай слепаты. Лячэнне: хірург. аперацыя, пасля яе акуляры.

Літ.: Архангельский В. Н. Глазные болезни, 2 изд., М., 1969; Бирич Т. В., Гордон Н. Б. и Кантор Д. К. Интракапсулярная экстракция катаракты с применением низких температур, у кн.: Труды IV съезда офтальмологов Украинской ССР, Киев, 1964. *Т. В. Бірыч.* Мінск.

КАТАРЫН Генадзь Іванавіч (18.11.1925, г. Анега Архангельскай губ.— 2.8.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. ВЛКСМ. На фронце з 1943. Вызначыўся ў чэрв. 1944 у Магілёўскай вобл. У час фарсіравання р. Проні К. знішчыў кулямётную кропку праціўніка. Кулямётны разлік на чале з К. адзін з першых фарсіраваў Дняпро і знішчыў 2 кулямётныя кропкі ворага. Загінуў у баі пры вызваленні Літвы.

КАТАСТРОФ ТЭОРЫЯ, катастрафізм (грэч. katastrophē знішчэнне, пагібель, пераварот), метафізічнае вучэнне пра развіццё зямной кары і арган. свету ў выніку перыядычных сусв. катастроф. Не ўлічвала эвалюцыі ў развіцці Зямлі.

Заснавальнік франц. палеантолаг Ж. Кюўе (1812). Эвалюцыя ў развіцці Зямлі паказана ў працах рус. вучоных М. В. Ламаносава, К. Ф. Рулье, англ. вучоных Ч. Лаеля і Ч. Дарвіна, франц. вучонага Ж. Б. Ламарка і інш. Паводле Ф. Энгельса («Дыялектыка прыроды», Мн., 1954, с. 11), К. т. «была рэвалюцыйная на словах і рэакцыйная на справе». Некаторыя бурж. вучоныя спрабавалі аднавіць К. т., распаўсюджваючы ле на развіццё грамадства.

Літ.: Энгельс Ф. Дыялектыка прыроды, Мн., 1954; Равикович А. И. Развитие основных теоретических направлений в геологии XIX века, М., 1969; Шатский Н. С. О неокатастрофизме, Избр. тр., т. 2, М., 1964.

КАТАЯМА Сэн (3.12.1859, в. Хадэгі, прэфектура Акаяма — 5.11.1933), дзеяч японскага і міжнар. рабочага руху, адзін з заснавальнікаў (1922) і кіраўнік Камуніст. партыі Японіі (КПЯ). З сялян. З 1881 працаваў у Токіо наборшчыкам, адначасова займаўся самаадукацыяй. У 1884 эміграваў у ЗША. Скончыў Іельскі ун-т (1895). У 1896 вярнуўся ў Японію і стаў актыўным удзельнікам рабочага руху. Ініцыятар стварэння ў 1901 С.-д. партыі Японіі (адразу ж забароненай урадам). У 1900 завочна выбраны чл. бюро Выкан-



кома 2-га Інтэрнацыянала. Удзельнік VI (Амстэрдамскага) кангрэсу (жн. 1904), дзе выступіў супраць руска-яп. вайны 1904—05. У 1914—21 у эміграцыі ў ЗША, дзе далучыўся да амер. сацыяліст. руху, стварыў першыя камуніст. групы з яп. рабочых (1918). Стаяў на ленінскай пазіцыі ў адносінах да 1-й сусв. вайны. У 1920 пераклаў на яп. мову працу У. І. Леніна «Дзяржава і рэвалюцыя». У 1921 эміграваў у Мексіку, адтуль 14.12.1921 пераехаў у Сав. Расію. Тры разы сустракаўся з Леніным. З ліст. 1922 чл. Выканкома Камінтэрна, потым яго Прэзідыума. Аўтар твораў па тэорыі і практыцы марксізма-ленінізма, гісторыі японскага рабочага і сялянскага руху, дзейнасці КПЯ, па пытаннях нацыянальна-вызваленчага руху. Пахаваны ў Маскве на Краснай плошчы.

Тв.: Рус. пер.— Статьи и мемуары, М., 1959 (бібліягр.); Воспоминания, М., 1964.

КАТКА, вёска ў Глускім р-не Магілёўскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Зара». За 24 *км* на Пд ад Глуска, 194 *км* ад Магілёва, 15 *км* ад чыг. ст. Залессе, на аўтамаб. дарозе Глуск — Акцябрскі. 378 ж., гасп. 121 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі, швейная і шавецкая майстэрні, сталовая, магазін. У 1942 вёску часткова спалілі нямфаш. захопнікі. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны.

КАТКОЎ Сяргей Пятровіч [н. 18.9(1.10).1911, в. Скрыпіцына Сярдобскага пав. Саратаўскай губ.], беларускі савецкі жывапісец і педагог. Засл. настаўнік БССР (1966). Чл. КПСС з 1943. Удзельнік Айч. вайны. Скончыў Пен-



С. П. Каткоў. У раёне аўтазавода. 1961. Дзярж. маст. музей БССР.

зенскі маст.-пед. тэхнікум (1931). З 1937 мастак-педагог і кіраўнік маст. студыі пры мінскім Палацы піянераў. Працуе ў жанры пейзажа і нацюрморта («Восеньскі пейзаж», 1947; «На рацэ», 1959; «Будаўніцтва дамбы», 1960; «Зіма. Даўгінаўскі тракт», «У раёне аўтазавода», абодва 1961; «Індустрыяльны пейзаж», 1967; «Раённы цэнтр», 1968; «Белыя лілеі», 1971). У Дзярж. маст. музеі БССР 20 работ мастака.

КАТЛАВЕЦ Міхаіл Паўлавіч (1914, в. Скрыгалаў Мазырскага пав. Мінскай губ.— 6.10.1944), Герой Сав. Саюза (1945). З сялян. Чл. КПСС. У Чырв. Арміі з 1938. У Айч. вайну на Зах., Сталінградскім, 2-м Укр. франтах — камандзір танкавага батальёна. Вызначыўся ў студз. 1944 у баі за чыг. ст. Лялекаўка каля Кіраваграда. Батальён пад камандаваннем К. знішчыў 7 варожых танкаў і за дзень адбіў 6 контратак; 5.10.1944 на



румынска-венгерскай граніцы батальён знішчыў 5 варожых гармат, 100 павозак з боепрыпасамі, узяў у палон 130 фаш. салдатаў і афіцэраў. Загінуў у гэтым баі.

КАТЛЯРЭЎСКІ Іван Пятровіч [29.8(9.9).1769, Палтава — 29.10(10.11).1838], украінскі пісьменнік, пачынальнік новай укр. паэзіі. Сын дробнага чыноўніка. Вучыўся ў Палтаўскай духоўнай семінарыі (1780—89). З 1793 настаўнічаў, вывучаў побыт, звычаі, абрады ўкр. сялян. У 1796—1808 на вайск. службе (у 1807—08 у Лідзе на Беларусі). Быў блізкі да дзекабрыстаў (з 1818), хоць у грамадска-паліт. поглядах стаяў на пазіцыях памяркоўнага асветніцтва. Дырэктар Палтаўскага т-ра (1818—21).



У 1794 пачаў пісаць паэму «Энеіда», якая адразу стала распаўсюджвацца ў спісах. У 1798 і 1808 без ведама аўтара выдадзена ў Пецярбурзе. У 1809 К. выдаў «Энеіду» (ч. 1—4) з папраўкамі і дапаўненнямі. Поўнасцю надрукавана ў 1842 у Харкаве. На сюжэтнай аснове паэмы Вергілія К. па-майстэрску паказаў жыццё і побыт розных грамадскіх слаёў укр. народа 2-й пал. 18 ст. Рэаліст. тэндэнцыі ў адлюстраванні ўкр. рачаіснасці, элементы сац. сатыры, шчыры гумар, вобразная нар. мова надалі твору выразны нац. каларыт, вызначылі яго грамадскае і маст. значэнне. Паэма К. мела ўплыў на бел. ананімныя паэмы *«Тарас на Парнасе»* і асабліва *«Энеіду навыварат»*. Дасягненнем рэалізму ў укр. л-ры былі п'есы К. «Наталка-Палтаўка» (апубл. 1838, аднайм. опера М. Лысенкі 1889) і «Маскаль-чараўнік» (апубл. 1841). Пастаўлены ў Мінску (1848, 1849) гар. т-рам. Некат. песні з «Наталкі-Палтаўкі» перайшлі ў бел. фальклор («Дуюць ветры, дуюць буйны», «Бацька руды», «Палюбіла б Петруся»). У 1952 адкрыты дом-музей К. ў Палтаве. Яго творы перакладзены на многія мовы.

Тв.: Повне зібрання творів, Київ, 1969; бел. пер.— Энеіда, пер. А. Куляшова, Мн., 1969; рус. пер.— Соч., 2 изд., Л., 1969; Энеида, М.—Л., 1961.

Літ.: Волинський П. К. Іван Котляревський, 2 вид., Київ, 1969; Хропко П. Іван Котляревський, Київ, 1969; І. Котляревський у документах, спогадах, дослідженнях, Київ, 1969.

КАТМАНДУ, сталіца Непала. Размешчана ў міжгорнай катлавіне Гімалаяў на выш. 1360 *м* над узр. м. Засн. ў 724 пад назвай Кантыпур. Аўтамаб. дарогай злучаны з гарадамі Індыі. Аэрапорт. Больш за 224,9 тыс. ж. (1970). Цэнтр с.-г. раёна. Саматужная вытворчасць адзення, абутку, ювелірных і гаспадарчых вырабаў. Малочны з-д, друкарня. Ун-т, Нац. музей.

КАТОД (грэч. kathodos ход уніз, вяртанне), 1) адмоўны электрод электралітычнай ванны, гальванічнага элемента, акумулятара і інш. прылад. 2) Электрод электравакуумных і газаразрадных прылад, які эмітуе (вылучае) электроны.

У залежнасці ад характару эмісіі электронаў К. бываюць тэрмаэлектронныя, халодныя і фотакатоды. Найб. распаўсюджаны тэрмаэлектронныя К., якія эмітуюць электроны пры награванні. Па-ходле канструкцыі бываюць з непасрэдным напалам і з ускосным (падагрэўным). Да халодных К. адносяцца: аўтаэлектронныя (электроны вылучаюцца ці дзеянне моцнага знешняга эл. поля); К. з самападтрымлівальнай эмісіяй і халодныя К. ў прыладах тлеючага, іскравога і кароннага разрадаў. У фотакатодах электроны эмітуюцца пад дзеяннем святла.

Літ.: Власов В. Ф. Электронные и ионные приборы, 3 изд., М., 1960.

КАТОДНАЕ РАСПЫЛЕННЕ, распыленне матэрыялу катода ў вакууме пры газавым разрадзе пад дзеяннем дадатных іонаў газу і высокай т-ры. У газаразрадных прыладах К. р. пагаршае міжэлектродную ізаляцыю, разбурае катод і скарачае тэрмін работы. У тэхніцы К. р. выкарыстоўваецца для ўтварэння на вырабах тонкіх (долі мікраметра) метал. плёнак.

Выраб, прызначаны для апрацоўкі, кладуць на анод, а катодную пласціну з патрэбнага металу размяшчаюць на адлегласці ад 1 да 10 *см* паралельна паверхні вырабу. Уся сістэма размяшчаецца ў герметычным балоне, у якім ствараецца вакуум да $0{,}13$ *н/м*² (10^{-3} *мм рт. сл.*). Прыкладзенае напружанне залежыць ад велічыні паверхні вырабу і складае 1—20 *кв*.

КАТОК, 1) у будаўніцтве — прычэпная ці самаходная машына, якая ўшчыльняе грунт, дарожныя пакрыцці і інш. Рабочым органам К. з'яўляюцца цыліндрычныя вальцы (гладкія, рабрыстыя, кулачковыя, крацістыя) ці колы на гумавых шынах. Самаходныя К. маюць масу ад 0,5 да 25 *т*, прычэпныя да 100 *т*. Пашыраюцца вібракаткі. 2) У сельскай гаспадарцы — прылады, якімі дробяць глебы, камякі і скарынку, выраўноўваюць і ўшчыльняюць глебу. Адрозніваюць гладкія, кольчатыя, зубчастыя і камбінаваныя. Бываюць адна- і двухрадныя, адна- і трохзвенныя. 3) У спорце — канькабежная гарызантальная пляцоўка з роўнай ледзяной паверхнявай. Бываюць К. спартыўныя, для відовішчаў і гульняў.



Самаходны вібрацыйны каток.

КАТОН Марк Порцый Старэйшы (Marcus Porcius Cato Maior; 234—149 да н. э.), дзярж. дзеяч і гісторык Ст. Рыма. З саслоўя коннікаў. Абараняў інтарэсы набілітэту — буйных рабаўладальнікаў і гандлёва-ліхвярскіх колаў. Займаў многія дзярж. пасады. Падтрымліваў палітыку новых заваёў. Першы з рым. гісторыкаў пісаў на лац. мове. Прамовы, творы К. па гісторыі Рыма, інш. плямёнаў і гарадоў Італіі не зберагліся. Трактат «Земляробства» мае каштоўныя звесткі пра эканоміку Італіі 2 ст. да н. э.

Тв.: Рус. пер.— Земледелие, М.— Л., 1950.
Літ.: Плутарх. Сравнительные жизнеописания, т. 1, М., 1961.

КАТОН (Cotton) Эжэні (13.10.1881, г. Субіз, Зах. Францыя — 16.6.1967), дзеячка французскага і міжнар. дэмакратычнага руху, вучоны-фізік. З 1904 выкладчык, у 1936—41 дырэктар, з 1945 ганаровы дырэктар педагагічнага інстытута ў Сеўры. У 2-ю сусветную вайну ўдзельнічала ў Руху Супраціўлення. З 1945 старшыня Міжнар. дэмакр. федэрацыі жанчын. У 1949—50 чл. Пастаяннага камітэта Сусв. кангрэсу прыхільнікаў міру. З 1950 віцэ-старшыня, з 1959 чл. Прэзідыума Сусв. Савета Міру. Міжнар. Ленінская прэмія «За ўмацаванне міру паміж народамі» за 1950.



КАТОЎСКАЕ, возера ў бас. р. Тураўлянкі, левага прытока Зах. Дзвіны, у Лепельскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 0,55 *км*². Даўж. 1,4 *км*, найб. шыр. 0,6 *км*, сярэдняя 0,4 *км*, найб. глыб. 16 *м*. Катлавіна выцягнута з ПнУ на ПдЗ. Схілы пераважна пад ворывам. Вадазбор (88,7 *км*²) градава-ўзгорысты, марэнны. Возера зарастае каля берагоў; праточнае, праз яго працякае р. Дзіва. Водзяцца плотка, шчупак, акунь, лешч, лінь.

КАТОЎСКІ Рыгор Іванавіч [12(24).6.1881, мяст. Ганчэшты Кішынёўскага пав. Бесарабскай губ.— 6.8.1925], герой грамадз. вайны. З сям'і механіка. Чл. КПСС з 1920. У ліст. 1905 і пач. 1915 арганізаваў і кіраваў узбр. паўстанцкімі атрадамі малд. сялян. Неадноч-



ны арыштоўваўся і высылаўся на катаргу. З мая 1917 на Румынскім фронце. У ліст. 1917 далучаўся да левых эсэраў, потым перайшоў да бальшавікоў. З студз. 1918 камандзір Ціраспальскага атрада, камбрыг 45-й стралк. дывізіі. У складзе групы І. Э. Якіра ажыццявіў паход ад Днястра да Жытоміра. Удзельнік абароны Петраграда

(ліст. 1919). У 1920 фарміраваў, потым камандаваў кав. брыгадай на Пд Украіны і на сав.-польскім фронце; у 1921 — кав. часцямі па ліквідацыі махноўшчыны і пятлюраўшчыны. З вер. 1921 нач. 9-й кав. дывізіі, камандзір 2-га кав. корпуса. Чл. ЦВК СССР. Узнаг. 3 ордэнамі Чырв. Сцяга. Па-здрадніцку забіты ў саўгасе Чабанка (каля Адэсы).

Літ.: Г. И. Котовский. Сб., Кишинев, 1956 (бібліягр.); Воспоминания о Г. И. Котовском, Кишинев, 1961; Есауленко А. С. Революционный путь Г. И. Котовского, Кишинев, 1956.

КАТУЛ Гай Валерый (Gaius Valerius Catullus; 87 ці 84 да н. э., Верона — пасля 54 да н. э.), рымскі паэт. Збярогся яго зб. з 116 вершаў. У лірычных вершах да Лесбіі (Клодыі) паказаў каханне як высакароднае адухоўленае пачуццё. У аснове паліт. вершаў супраць Цэзара і яго паплечнікаў — непрыязныя асабістыя адносіны. Расчараванне ў грамадскіх ідэалах, каханні і дружбе надало творчасці К. вострую псіхалагічнасць. Творча засвоіўшы дасягненні *александрыйскай паэзіі*, врабіў іх здабыткам рым. лірыкі.

Тв.: Рус. пер.— у кн.: Валерий Катулл.— Альбий Тибулл.— Секст Проперций, М., 1963.

КАТУНІН Ілья Барысавіч [4(17).11.1908, Гомель — 23.4.1944], Герой Сав. Саюза (1944). З рабочых. Чл. КПСС з 1931. Скончыў Ейскую школу марскіх лётчыкаў (1934). У 1927—32 слесар з-да «Пралетарый» у Гомелі; з 1934 у Арджанікідзеўскім і Бранскім аэраклубах. У Айч. вайну на Паўн. флоце — нам. камандзіра авіяэскадрыллі. 23.4.1944, ведучы васьмёрку штурмавікоў, на падыходзе да цэлі быў падбіты агнём варожай зенітнай артылерыі. Капітан К. паўтарыў подзвіг М. Ф. Гастэлы: самалётам, ахопленым полымем, тараніў варожы транспарт водазмяшчэннем 5000 *т* і затаніў яго. Навечна залічаны ў спісы эскадрыллі мінна-тарпеднага авіяц. палка.



КАТУШАЎ Канстанцін Фёдаравіч (н. 1.10. 1927, в. Болдзіна Арзамаскай акр. Ніжагародскай губ.), савецкі парт. дзеяч, сакратар ЦК КПСС. З служачых. Чл. КПСС з 1952. Скончыў Горкаўскі політэхн. ін-т імя Жданава (1951). У 1951—57 на Горкаўскім аўтазаводзе. З 1957 на парт. рабоце ў Горкім. У 1963—65 першы сакратар гаркома, з 1965 Горкаўскага абкома КПСС. З крас. 1968 сакратар ЦК КПСС. На XXIII—XXIV з'ездах КПСС выбраны чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета СССР 7—8-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, медалямі.



КАТУШОНКІ, вёска ў Нацкім с/с Полацкага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «1 Мая». За 35 *км* на ПдЗ ад Полацка, 140 *км* ад Віцебска, 3 *км* ад чыг. ст. Загацце, каля аўтамаб. дарогі Полацк — Глыбокае (2 *км*). 128 ж., гасп. 42 (1971). Пач. школа, б-ка, магазін.

КАТЧЫНО, вёска ў Азёркаўскім с/с Мастоўскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса «Шчара». За 50 *км* на ПдУ ад Мастоў, 110 *км* ад Гродна, 20 *км* ад чыг. ст. Зэльва. 367 ж., гасп. 105 (1971). Васьмігадовая школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Помнік 40 сав. воінам-аднавяскоўцам, якія загінулі ў Айч. вайну.

КАТЫ, вёска ў Сінькаўскім с/с Смаргонскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса «Маяк». За 12 *км* на ПдУ ад Смаргоні, 272 *км* ад Гродна, 7 *км* ад чыг. ст. Залессе. 170 ж., дварoў 44 (1971). Клуб, б-ка, магазін. Помнік 38 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

КАТБІРЛА Васіль Ігнатавіч (каля 1838, Віцебская губ.— г. см. невяд.), удзельнік рэвалюц. руху 60-х г. 19 ст. З сям'і дробнага чыноўніка. Скончыў Віцебскую гімназію. З 1859 вольны слухач Пецярбургскага ун-та. Удзельнічаў у студэнцкім руху, чл. арг-цыі «Зямля і воля». З лютага 1863 на радзіме: распаўсюджваў сярод салдатаў і насельніцтва Оршы пракламацыю ЦК «Зямлі і волі» «Льецца польская кроў, льецца руская кроў...», вёў агітацыю за паўстанне, вербаваў людзей у атрады. Ваен. судом у Магілёве засуджаны на 10 гадоў катаргі.

Літ.: Паўстанне ў Літве і Беларусі 1863—1864 гг., М., 1965 (Восстание 1863 г. Материалы и документы); Русско-польские революционные связи, т. 2, М., 1963 (Восстание 1863 г. Материалы и документы). *Г. В. Кісялёў.* Вільнюс.

КАТЭГАТ (Kattegatt), адзін з праліваў, які злучае Балтыйскае м. з Паўночным, паміж п-вам Ютландыя і паўд.-зах. ч. Скандынаўскага п-ва. Даўж. каля 200 *км*, шыр. 60—122 *км*, глыб. 26—124 *м*. Зімой каля берагоў замярзае. На ўсх. беразе порт Гётэбарг (Швецыя).

КАТЭГОРЫІ (грэч. katēgoria выказванне), асноўныя і найбольш агульныя паняцці той ці інш. навукі, тэорыі, якія адлюстроўваюць істотныя сувязі, уласцівасці, адносіны з'яў і прадметаў навакольнага свету. Маюць аб'ектыўны змест, адрозніваюцца па ступені агульнасці і па сваіх пазнавальных функцыях.

К. ўтвараюцца ў працэсе гістар. развіцця навукі як тэарэт. абагульненне чалавечага пазнання і практыкі. Звязаны між сабою пэўным чынам у форме каардынацыі і субардынацыі і ўтвараюць адносна самаст. сістэмы ў лагічнай структуры ведаў. Побач з катэгорыямі асобных навук існуе сістэма К. дыялектыкі. Асн. прынцыпы пабудовы сістэмы К. дыялектыкі — адзінства гістар. і лагічнага, развіццё пазнання ад з'явы да сутнасці, ад абстрактнага да канкрэтнага, ад простага да складанага. У сувязі з развіццём навакольнага свету і прагрэсам навук. пазнання павялічваецца колькасць і ўзбагачаецца змест К. дыялектыкі, сістэма якіх паступова набліжаецца да найбольш поўнага і ўсебаковага адлюстравання аб'ектыўнай рэальнасці. К. ўзаемазвязаны з асн. законамі матэрыялісц. дыялектыкі, а таксама са спец. паняццямі і прынцыпамі прыватных навук. Аб'ектыўны змест К. дыялект. матэрыялізму вызначае іх метадалагічнае значэнне ў пазнанні і практыцы.

Літ.: Энгельс Ф. Дыялектыка прыроды, Мн., 1954; Ленін У. І. Філасофскія сшыткі, Тв., т. 38 (Полн. собр. соч., т. 29); Шептулин А. П. Система категорий диалектики, М., 1967; Широков Д. И. Взаимосвязь категорий диалектики, Мн., 1969; Категории диалектики и методология современной науки, Воронеж, 1970.

Ю. А. Гусеў. Мінск.

КАТЭПСІНЫ (грэч. kathepsein ператраўляць), група пратэалітычных *ферментаў*. Ёсць амаль ва ўсіх тканках жывёльных арганізмаў і чалавека, некаторыя, напр. папаін, ёсць у раслінных арганізмах. Асабліва многа К. у печані, нырках, селязёнцы. Катализуюць гідроліз бялкоў з утварэннем полі-пептыдаў.

Найб. актыўныя К. ў кіслым асяроддзі (пры pH 4—5). Дзейнасць К. у жывёльным арганізме ўмацняецца пры парушэнні жыўлення тканкі, недастатковым забеспячэнні органа кіслародам; асабліва актывізуецца пасля смерці жывёлы, калі канцэнтрацыя вадародных іонаў павялічваецца за кошт утварэння малочнай к-ты.

Літ.: Збарский Б. И., Иванов И. И. и Мардашев С. Р. Биологическая химия, 4 изд., М., 1965; Штрауб Ф. Б. Биохимия, пер. с венг., 2 изд., Будапешт, 1965.

КАТЭР (галанд. kotter), 1) невялікае (водазмяшчэннем да 100 *т*) самаходнае судна для перавозкі людзей і грузаў, для спартыўных, ваенных (тарпедны, вартавы, дэсантны і інш.)



і прамысл. мэт. На Беларусі К. выпускае Гомельскі суднабудаўніча-суднарамонтны з-д (6-месны катэр «Волга» на падводных крылах, гл. рыс.). 2) Тып ваенна-марской парусна-грабной 10—16-вёславай шлюпкі. 3) Старадаўняе парусное аднамачтавае судна.

КАУМБАЕЎ Таганбай (н. 1923, с. Атра Кызыл-Кумскага р-на Чымкенцкай вобл.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). На фронце з 1942, разведчык. Вызначыўся ў Лоеўскім р-не Гомельскай вобл. 15.10.1943 з групай разведчыкаў пераправіўся цераз Дняпро, выбіў ворага з акопаў. На захопленым плацдарме з яго ўдзелам адбіта 3 контратакі, забяспечана высадка падраздзяленняў. Жыве ў Сырдар'інскай вобл.

КАУНДА (Kaunda) Кенет Давід (н. 28.4. 1924, правінцыя Чынсалі), дзярж. дзеяч Замбіі, дзеяч нац.-вызв. руху народаў Афрыкі. Пасля 1949 адзін з лідэраў партыі Афрыканскі нац. кангрэс (АНК). У 1952 выбраны ген. сакратаром АНК. У пач. 1959 заснаваў партыю Афрыканскі нац. кангрэс Замбіі (забаронена ў сак. 1959); быў зняволены на 9 месяцаў. З 1960 старшыня Аб'яднанай партыі нац. незалежнасці, у 1962—64 міністр мясцовага самакіравання і сац. забеспячэння. У студз.— кастр. 1964 прэм'ер-міністр Паўн. Радэзіі, з кастр. 1964 прэзідэнт Замбіі (назва Паўн. Радэзіі пасля абвяшчэння незалежнасці 24.10.1964).

КАЎРЫ (сургаса moneta), ракавіна марскога малюска.

У стараж. часы К. ўжываліся як упрыгожанне, а таксама як грошы ў народаў узбярэжжа Ціхага і Індыйскага акіянаў, у 1-е тысячагоддзе да н. э. ў народаў Сярэдняй Азіі, у раннім сярэдневякоўе (12—13 ст.) на Русі, у Прыбалтыцы, Скандынавіі, Германіі, Англіі і інш. Трапляюцца як асобныя скарбы або разам з дырхемамі і дэнарыямі.

Літ.: Спасский И. Г. Русская монетная система, 4 изд., Л., 1970. *В. Н. Рабцэвіч.* Мінск.

КАЎГАРЫ, вёска ў Дараганаўскім с/с Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл., каля р. Пціч (1,5 *км*). Цэнтр саўгаса «Каўгарскі». За 24 *км* на ПдЗ ад Асіповіч, 157 *км* ад Магілёва, 3 *км* ад чыг. ст. Дараганава. 430 ж., дварoў 145 (1971). Спірт. з-д. Пач. школа, клуб, б-ка, дзіцячыя яслі-сад, 2 магазіны. Помнік на магіле 3 сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

КАЎЗАЛЬНАСЦЬ (лац. causalis прычынны), тое, што прычыннасць (гл. ў арт. *Выпік і прычына*).

КАЎКАЗ, пераважна горная краіна на Пд СССР. Распасціраецца ад Кума-Манычскай упадзіны да дзярж. граніцы СССР з Турцыяй і Іранам. Абмываецца Чорным, Азоўскім і Каспійскім морамі. Пл. 440 тыс. км². К. падзяляецца на Перадкаўказзе, Вялікі К., раўніны Закаўказзя і Закаўказскае нагор'е. На Пн і ў сярэдняй ч. Перадкаўказзя — платформенная структура з герцынскім складкавым фундаментам, укрытая палеагенавымі, неагенавымі і чацвярцічнымі пародамі. Далей на Пд — перадгорны прагін, найб. выразны на З і У (нізоўі Кубані і Церака). У араграфіі Перадкаўказзя выдзяляюць Кубана-Прыазоўскую нізіну, Стаўрапольскае ўзв. (831 *м*), Мінералаводскую групу вулканічных гор — лакалітаў (Бештаў, 1400 *м*) і Церска-Кумскую нізіну. Горная сістэма Вял. К. цягнецца ад Таманскага п-ва да Апшэронскага на 1500 *км*, шыр. 160—180 *км*. Узнікла на месцы мезазойскай геасінкліналі ў выніку *альпійскай складкавасці*. У зах. і цэнтр. ч. залягае ядро з верхнепратэразойскіх, палеазойскіх і трыясавых парод. Іх паслядоўна акаймоўваюць

Вялікі Каўказ. Эльбрус.



юрскія, мелавыя, палеагенавыя і неагенавыя тоўшчы. Восевую зону Вял. К. ўтвараюць хрыбты Водападзельны, або Галоўны, і Бакавы з выш. больш за 4 і 5 тыс. *м*: Эльбрус (5642 *м*), Дыхтаў (5203 *м*), Шхара (5058 *м*), Казбек (5033 *м*), Тэбуласмта (4492 *м*), Базардзюзю (4466 *м*), Шахдаг (4243 *м*). На Пн і Пд ад восевай зоны перадавыя хрыбты, якія на паўн. схіле зах. паловы Вял. К. маюць характар *куэстаў*, у астатніх месцах складкавыя. З Пн Вял. К. акаймаваны ўзгорыстымі перадгор'ямі; паўн. схілы ў параўнанні з паўднёвымі, стромкімі і абрывістымі, больш пакатыя. Вял. і Малы К. падзяляюць Калхідская нізіна і Курынская ўпадзіна (асн. частку яе займае Кура-Араксінская нізіна), запоўненыя пераважна чацвярцічнымі і больш стараж. адкладамі марскога і кантынентальнага паходжання. На Пд К. падымаецца Закаўказскае нагор'е — хрыбты Малога К. і Армянскага нагор'я з вяршыняй Арагац (4090 *м*). Малы К. складзены з асадкавых і вулканагенных парод; Армянскае нагор'е ўкрыта вулканічнымі пародамі неагенавага і чацвярцічнага часу. Карысныя выкапні К.: нафта і газ (Апшэронскі п-аў, Перадкаўказзе і інш.), кам. вугаль (Ткібулі, Ткварчэлі), марганец (Чыятура), жал. руда (Дашкесан), медзь і малібдэн (Арменія), алуніт (Заглік), поліметалы, буд. матэрыялы, мінер. воды.

Клімат у Перадкаўказзі і на паўн. схіле Вял. К. ўмераны, на раўнінах Закаўказзя субтрапічны, у гарах вышынная кліматычная пояснасць (гл. табліцу). Сучаснае абледзяненне (амаль 2 тыс. км²) развіта на Вял. К. Рэкі басейнаў Каспійскага (Кура з Араксам, Сулак, Церак, Кума), Чорнага (Рыёні, Інгуры, Кадоры, Бзыб), Азоўскага (Кубань з прытокамі) мораў. Сярэдні гадавы сцёк і рэжым залежаць ад кліматычных умоў і рэльефу мясцовасці. Суднаходныя ў ніжнім цячэнні Кубань, Кура, Рыёні. У засушлівых раёнах рэкі выкарыстоўваюцца на арашэнне. Многа гідраэлектрастанцый. Азёры тэктанічныя, каравыя, карставыя, вулканічныя і інш. Найб. Севан. Глебы Перадкаўказзя чарназёмныя. На У светла-каштанавыя з саланцамі і саланчакамі. На Вял. К., асабліва на паўд. схілах, да выш. 2000—2200 *м* бурыя горна-лясныя глебы, якія вышэй пераходзяць у горна-лугавыя субальпійскія і альпійскія. У Калхідскай нізіне пераважаюць балотныя, алювіяльныя, падзоліста-глеевыя і субтрапічныя падзолістыя глебы. На прыўзнятых ускраінах жаўтазёмы і чырваназемы. На Кура-Араксінскай нізіне і Апшэронскім п-ве шэразёмы і шэра-карычневыя паўпустынныя глебы сухіх субтропікаў. У Талышскіх гарах — падзоліста-жаўтазёмныя ў перадгор'ях і горна-лясныя бурыя на схілах гор. На Малым К. і Армянскім нагор'і горныя чарназёмы, бурыя горна-лясныя і горна-лугавыя глебы. Расліннасць багатая і разнастайная. У флоры больш за 6000 відаў, у т. л. каля 20% эндэмікаў. Асталася рэліктавая неагенавая расліннасць (мяшаныя лясы Калхіды і Талышскіх гор). На З і ў цэнтр. ч. Перадкаўказзя стэпы



амаль разараныя; на У паўпустыні. У межах Вял. К. выразная вышынная пояснасць. Унізе схілаў шыракалістыя лясы (дуб, бук і інш.), вышэй піхтава-яловыя (на З), хваёвыя (на У), яшчэ вышэй субальпійскія і альпійскія лугі. Вял. прасторы Калхідскай нізіны заняты субтрапічнымі культурамі. У Кура-Араксінскай нізіне пераважаюць эфемерава-палыновыя і салянкавыя пустыні, у перадгор'ях зараснікі шыбляку. Малы К. і Талышскія горы ўкрыты субтрапічнымі горна-шыракалістымі лясамі (каштанавы дуб, бук). На Армянскім нагор'і пераважаюць стэпы. У Перадкаўказзі жывёльны свет, як і ў стэпах Рускай раўніны. У лясах Вял. і Малога К.— буры мядзведзь, рысь, ліс, куніцы (лясная і каменная), сарна, высакародны алень, соня-палчок, снежная палёўка. Эндэмікі на Вял. К.— дагестанскі тур, каўказскія цецярук і ўлар, праметэева мыш. На Кура-Араксінскай нізіне антылопа джэйран, тушканчыкі, вушасты вожык, чырванахвостая пясчанка, гюрза. У Талышскіх гарах — леапард, дзікабраз. У тугаях — чаротавы кот. Многа вадаплаўных птушак. Найб. запаведнікі: Тэбердзінскі, Каўказскі, Закатальскі, Кызылагаджскі імя Кірава.

Асноўныя кліматычныя паказчыкі

Фізіка-геаграфічныя падвобласці	Сярэднемесячная тэмпература, °С		Ападкаў за год, *мм*
	ліпень	студзень	
Кубана-Прыазоўская нізіна	23	—2	624
Чарнаморскае ўзбярэжжа Паўн. Каўказа	22	4	736
Церска-Кумская нізіна	24	—2	308
Каспійскае ўзбярэжжа Паўн. Каўказа	25	—1	192
Вялікі Каўказ (2800 *м* над узр. м.)	12	—6	1872
Даліна Рыёні	22	6	1648
Кура-Араксінская нізіна	26	2	228
Ленкаранская нізіна	25	3	1248
Арарацкая даліна	26	—6	332

На К. размешчаны Краснадарскі край (уключае Адыгейскую а. в.), Стаўрапольскі край (уключае Карачаева-Чаркескую а. в.), Кабардзіна-Балкарская АССР, Паўн.-Асецінская АССР, Чэчэна-Інгушская АССР, Дагестанская АССР — усе ў складзе РСФСР, а таксама Азерб. ССР (уключае Нахічэванскую АССР і Нагорна-Карабахскую а. в.), Арм. ССР, Груз. ССР (уключае Абх. АССР, Адж. АССР і Паўд.-Асецінскую а. в.). Звесткі пра насельніцтва, гісторыю, гаспадарку, культуру гл. ў адпаведных артыкулах пра саюзныя і аўтаномныя рэспублікі, краі, аўтаномныя вобласці.

Курорты К.— лячэбныя мясцовасці з мінер. крыніцамі, лекавымі гразямі і з асабліва спрыяльнымі кліматычнымі ўмовамі. На К. больш за ¼ курортаў СССР. Прыморскія курорты пераважна кліматычныя. У раёне Новарасійска — Туапсе: *Анапа* (пераважна дзіцячы, з гразямі Чумбурскага воз.), Кабардзінка, *Геленджык*, Джанхот, Архіпа-Осіпаўка; у раёне Туапсе — Сочы — Адлер: Джубга, Новаміхайлаўскі, Небург, Галавінка, *Сочы*; на тэр. Абх. АССР — Леселідзе, *Гагра*, Мюсера, Піцунда, Гудаута, Новы Афон (Ахалі-Афоні), *Сухумі*, Гульрыпшы, Ачамчыра і інш.; на тэр. Адж. СССР — Батумі, Кабулеты, Цыхісдзіры, Махінджауры, Зялёны Мыс. На ўзбярэжжы Каспійскага м., пераважна на Апшэронскім п-ве, курорты Мардакян, Бузаўна, Загульба, Більгях, Піршага, Туркяны. У Стаўрапольскім краі бальнеалагічныя і кліматычныя курорты — *Каўказскія Мінеральныя Воды*. Высакагорныя кліматычныя курорты для хворых на туберкулёз: Абастумані, Тэберда, Дыліжан, Цэй. На курорце Нафталан як лекавы сродак ужываюць нафту. Бальнеалагічныя курорты з серавадароднымі, вуглякіслымі мінер. водамі — Талгі, Менджы, Арзні; з тэрмальнымі водамі — Істысу (52,5°), Джэрмук (64°); з радонавымі водамі — *Цхалтуба*. На К. лечаць ад хвароб крыві, нервовай (функцыянальныя) і сардэчна-сасудзістай сістэм, органаў стрававання, руху (нетуберкулёзныя), ад парушэнняў абмену рэчываў.

Літ.: Гвоздецкий Н. А. Кавказ, М., 1963; Грузия, М., 1967 (Советский Союз); Армения, М., 1966 (Советский Союз); Завриев В. Г. Физическая география Азербайджана и его районы, М., 1957; Кавказские Минеральные Воды, Ставрополь, 1960; Курорты СССР. М., 1962; Нодия М. Ю. Курортные богатства Грузии, Тбилиси, 1963; Здравницы профсоюзов СССР, 3 изд., М., 1967.

В. Р. Заўрыеў (прырода), *Б. В. Шалькевіч* (курорты). Мінск.

КАЎКАЗСКІЯ ВОЙНЫ, войны 18—19 ст., звязаныя з далучэннем Каўказа да Расіі. У К. в. ўключаюць войны Расіі з Іранам і Турцыяй [Персідскія паходы 1722—23 і 1769, рус.-іран. войны 1804—13 і 1826—28, ваен. дзеянні на Каўказе ў рус.-тур. войны (1768—74, 1787—91, 1806—12, 1828—29)], Крымскую вайну 1853—56, Каўказскую вайну 1817—64 — калан. вайну супраць горцаў Паўн. Каўказа, а таксама ваен. ўмяшанне царызму ў феад. міжусобіцы, задушэнне антыфеад. руху народаў Каўказа.

Пагроза тур. і іран. нашэсця прымушала народы Каўказа шукаць абароны ў Расіі. Каўказ зрабіўся аб'ектам барацьбы паміж Расіяй, Турцыяй і Іранам. У выніку паходу Пятра I (1722—23) рус. войскі занялі ўзбярэжжа Дагестана і Паўн. Азербайджана, аднак паводле Ганджынскага дагавору 1735 Расія вывела войскі за р. Церак. У выніку рус.-тур. вайны 1768—74 да Расіі далучана Кабарда. У 1783 Усх. Грузія перайшла пад пратэктарат Расіі. Напад персаў на Грузію ў 1795 прымусіў Расію актывізаваць дзеянні ў Закаўказзі. У 1801 да Расіі далучана Усх. Грузія, у 1802—06 Зах. Грузія, Асеція, Паўн. Азербайджан, у 1810 Абхазія, у 1813 Дагестан. Рус.-тур. вайна 1828—29 і рус.-іран. вайна 1826—28 закончыліся далучэннем да Расіі Усх. Арменіі, Паўд.-Зах. Грузіі і паўн. ч. Прычарнамор'я. У 1816 з рус. войск на Каўказе створаны Асобны корпус пад камандаваннем А. П. Ярмолава, з 1827 — І. Ф. Паскевіча. Каб заваяваць Паўн. Каўказ і Дагестан, разбураліся непакорныя аулы, стваралася сістэма ўмацаванняў, што выклікала ўздым нац.-вызв. руху горскіх народаў пад сцягам мюрыдызму. Гэты рух каля 1830 узначаліў Газі-Магамед, у 1834 — Шаміль, які аб'яднаў народы Чэчні і Дагестана. Барацьба супраць створанай Шамілем феад.-тэакратычнай дзяржавы (імамату) вялася да 1859. Пакарэнне Каўказа закончана ў 1864. Далучэнне Каўказа да Расіі, нягледзячы на цяжкі калан. прыгнёт, мела прагрэс. значэнне. Паскорылася развіццё капіталізму, узнік рабочы рух, цесна звязаны з рэвалюц. рухам Расіі, умацаваліся эканам. і культ. сувязі народаў Каўказа з народамі Расіі.

Літ.: Смирнов Н. А. Политика России на Кавказе в XVI—XIX вв., М., 1958; яго ж. Мюридизм на Кавказе, М., 1963; Иоаннисян А. Р. Присоединение Закавказья к России и международные отношения в начале XIX столетия, Ереван, 1958.

В. С. Паваліхіна. Мінск.

КАЎКАЗСКІЯ МІНЕРАЛЬНЫЯ ВОДЫ, група курортаў (*Пяцігорск, Есентукі, Кісла-*

водск, Железноводск) у Стаўрапольскім краі ў перадгор'ях паўн. схілу Галоўнага Каўказскага хрыбта. Асн. лекавы фактар — больш за 130 мінер. крыніц, з іх 90 выкарыстоўваюцца як лячэбныя. Клімататэрапія і лячэнне гразямі з Тамбуканскага воз. 80 санаторыяў больш як на 25 тыс. ложкаў (1970). Навук. дзейнасцю на К. М. В. кіруе Пяцігорскі НДІ курарталогіі і фізіятэрапіі.

Лекавыя якасці мінер. крыніц К. М. В. вядомы са старажытнасці. 24.4.1803 зацвярджана палажэнне пра К. М. В. як курорт. Даследавалі К. М. В. рус. урачы. Ф. П. Гааз апісаў лекавыя якасці мінер. крыніц (1809—10), А. П. Нялюбін склаў іх мед. характарыстыку (1823), С. А. Смірноў распаваў на К. М. В. рус. бальнеалагічнае навук. т-ва (1863). 11.6.1921 У. І. Ленін падпісаў пастанову СНК РСФСР аб нацыяналізацыі К. М. В.

Літ.: Кавказские Минеральные Воды, Ставрополь, 1960; Здравницы профсоюзов СССР, 3 изд., М., 1967. *Я. Ф. Калітоўскі.* Мінск.

КАЎКАЗСКІЯ МОВЫ, гл. *Іберыйска-каўказскія мовы.*

КАЎНАС (б. Коўна), горад рэсп. падпарадкавання ў Літоўскай ССР. На р. Нямунас, пры ўпадзенні ў яе Нярыс. Порт, вузел чыгунак і шашэйных дарог, аэрапорт. 314 тыс. ж. (1971). Развіта машынабудаванне і металаапрацоўка (вытворчасць станкоў, суднавых механізмаў, рачных суднаў, сродкаў аўтаматызацыі). Найбольшы ў Прыбалтыцы чыгуналіцейны з-д. 3 шарсцяныя, 3 трыкатажныя, футравая, гумавага абутку ф-кі; камбінаты шаўковы і штучнага валакна. Мясакамбінат, малочны і піваварны з-ды, кандытарская, тытунёвая ф-кі. Прадпрыемствы дрэваапр., хім., палігр. прамысловасці. Маст. промыслы. Непадалёку Каўнаская ГЭС (90 тыс. *квт*). Політэхн., мед., фіз. культуры ін-ты; с.-г. і ветэрынарная акадэміі. 9 сярэдніх спец. навуч. устаноў. Муз., драм. і лялечны тэатры. 7 музеяў (у т. л. гістарычны, мастацкі і інш.).

К. упершыню ўпамінаецца ў 11 ст. У 14 ст. крэпасць Вял. кн. Літоўскага, аб'ект нападу ням. рыцараў-крыжакоў. З 15 ст. значны пункт развіцця рамёстваў і гандлю, меў магдэбургскае права. З 1795 у складзе Рас. імперыі. Адзін з цэнтраў вызв. паўстанняў 1830—31 і 1863—64. З 1842 цэнтр Ковенскай губ. Працоўныя К. актыўна ўдзельнічалі ў рус. рэв. 1905—07. У жн. 1915 акупаваны ням. войскамі. У снеж. 1918 нелегальна створаны Савет рабочых дэпутатаў, які ў студз. 1919 разгромлены літ. буржуазіяй з дапамогай ням. акупантаў. У 1919—40 у К. знаходзіўся ўрад бурж. Літвы. Горад быў цэнтрам рэвалюц. руху, тут размяшчаліся падпольныя друкарні, склікаліся пленумы ЦК КП Літвы. Сав. ўлада ўстаноўлена 21.7.1940. У Айч. вайну акупаваны ням.-фаш. захопнікамі (24.6.1941—1.8.1944), разбураны.

КАЎНЯЦІН, вёска ў Лагішынскім с/с Пінскага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр калгаса «Шлях да камунізма». За 31 *км* на Пн ад Пінска, 210 *км* ад Брэста, каля аўтамаб. дарогі г. п. Лагішын — г. п. Ганцавічы (1 *км*). 934 ж., гасп. 199 (1971). За 1 *км* ад К. ваннавы з-д. Пач. школа, клуб, б-ка, магазін.

КАЎПАК Сідар Арцёмавіч [14(26).5.1887, с. Кацяльва Ахтырскага пав. Харкаўскай губ.— 11.12.1967], дзярж. і грамадскі дзеяч УССР, адзін з арганізатараў партыз. руху на Украіне ў грамадз. і Айч. войны. Двойчы Герой Сав. Саюза (1942, 1944), ген.-м. (1943). З сялян. Чл. КПСС з 1919. У 1-ю сусв. вайну на фронце. У жн. 1917 удзельнік барацьбы за Сав. ўладу ў Кацяльве. У грамадз. вайну на радзіме ўзначальваў партызанскі атрад. З мая 1919 у Чырвонай Арміі — баец 25-й Чапаеўскай дывізіі, удзельнік разгрому Урангеля. У 1937—41 старшыня Пуціўлеўскага гар. Савета дэпутатаў працоўных. У Айч. вайну камандзір партыз. атрада, потым злучэння Сумскай вобл., чл. нелегальнага ЦК КП(б)У.



Арганізоўваў рэйды па варожых тылах. Партызаны на чале з К. прайшлі 10 тыс. *км* з баямі ў глыбокім тыле праціўніка па 18 абласцях РСФСР, УССР, у БССР па Гомельскай, Пінскай абл., разбілі 39 гарнізонаў, знішчылі больш за 30 тыс. фашыстаў. У студз. 1943 на воз. Чырвонае (Жыткавіцкі р-н Палескай вобл.) злучэнне К. разам з партызанамі Беларусі арганізавала аэрадром. З 1947 нам. старшыні Прэзідыума Вярх. Савета УССР. Дэп. Вярх. Савета СССР 2—7-га скл. Узнаг. 4 ордэнамі Леніна, 3 інш. ордэнамі, медалямі, ордэнамі ПНР, ЧССР, Італіі.

Тв.: Из дневника партизанских походов, М., 1964; От Путивля до Карпат, М., 1970.

Літ.: Люди бессмертного подвига, кн. 1, М., 1961, с. 326—337. *М. С. Панга.* Роўна.

КАЎПІТА, рака, правы прыток Беседзі (бас. Дняпра). Даўж. 54 *км*. Цячэ ў Краснапольскім р-не Магілёўскай і Чачэрскім р-не Гомельскай абл. Вадазбор (549 *км*²) у межах Аршанска-Магілёўскай раўніны. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 2,7 *м*³/*сек*.

КАЎРОЎ Фёдар Кузьміч (1912, в. Пасуддзева Горацкага пав. Магілёўскай губ.— 9.7.1937), Герой Сав. Саюза (1937). З сялян. З 1931 у Данбасе. У Чырв. Арміі з 1934. Удзельнік баёў у Іспаніі на баку рэспубліканцаў — камандзір вежы танка. Вызначыўся ў баях каля г. Гвадалахара, Тэруэль. Узнаг. ордэнам Чырвонага Сцяга, ордэнам Чырвонай Зоркі. Загінуў у баі. Імем К. названа Святошынская школа Дубровенскага р-на Віцебскай вобласці.



КАЎРЫЖКА Ілья Паўлавіч (1923, Нованіколаеўск Томскай губ.— 3.5.1945), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). На фронце з 1943. Вызначыўся ў Камарынскім р-не Палескай вобл. У ноч на 27.9.1943 група байцоў разам з К. пад варожым агнём фарсіравала Дняпро, захапіла траншэі, замацавалася на плацдарме і на працягу дня адбівала контратакі пяхоты і танкаў. Загінуў у баі.

КАЎСТАБІЯЛІТЫ (ад грэч. kaustós гарачы+*біля*...+lithos камень), горучыя выкапні арган. паходжання. Паводле фіз. уласцівасцей падзяляюцца на цвёрдыя *(торф, вугалі выкапнёвыя, горучыя сланцы, асфальты, азакерыты)*, вадкія *(нафта)* і газападобныя (прыродныя і спадарожныя нафтавыя газы). На Беларусі выяўлены радовішчы торфу, бурага вугалю, горучых сланцаў, нафты. Сусв. прагнозныя запасы К. 12 394 млрд. *т* умоўнага паліва, з іх на тэр. СССР 6601 млрд. *т*, ці 53,3%.

Літ.: Муратов В. Н. Геология каустобиолитов, М., 1970.

КАЎТЭН Васіль Яўхімавіч (н. 15.9.1921, с. Буглан Літынскага пав. Падольскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1942. На фронце з 1941, камандзір разведроты. Вызначыўся ў Камарынскім р-не Палескай вобл. 28.9.1943 група разведчыкаў на чале з К. пераправілася цераз Дняпро, прайшла ў тыл ворага на 5 *км*, разведала абарону, перадала па радыё звесткі пра размяшчэнне агнявых кропак праціўніка. Гэтым садзейнічала паспяховаму фарсіраванню ракі дывізіяй. Жыве ў Кішынёве.

КАЎТЭН Павел Максімавіч [н. 31.3(13.4). 1913, с. Міраполле Суджанскага пав. Курскай губерні], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1943. На фронце з 1942. Вызначыўся ў Камарынскім р-не Палескай вобл. 28.9.1943 група байцоў разам з К. фарсіравала Дняпро, разведала абарону ворага, адбіла 8 контратак, замацавалася на плацдарме. К. пад агнём праціўніка зноў пераплыў раку, даставіў у штаб дывізіі данясенне. Жыве ў Ташкенце.

КАЎТУНОЎ Георгій Мікітавіч (н. 26.5.1918, с. Арохаўка Самарскага пав.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Ген.-л. (1965). На фронце з 1941, камандзір артыл. палка. Вызначыўся пры фарсіраванні Зах. Дзвіны і разгроме полацкай групоўкі праціўніка. 24.6.1944 полк пад камандаваннем К. памог штурмавой групе пяхоты і артылерыі паспяхова пераправіцца цераз раку і развіць наступленне. Жыве ў Маскве.

КАЎЦКІ (Kautsky) Карл (16.10.1854, Прага — 17.10.1938), адзін з тэарэтыкаў германскай с.-д. партыі і 2-га Інтэрнацыянала, ідэолаг цэнтрызму, адзін з заснавальнікаў *рэвізіянізму*. У 1874 далучыўся да сацыялістычнага руху. У 1883—88 заснаваў і рэдагаваў тэарэт. орган герм. сацыял-дэмакратыі «Die neue Zeit» («Новы час»). Падзяляў спачатку лассальянскія і анархісцкія погляды, потым — марксісцкія. Да марксізма К. прыйшоў ад *вульгарызатарскага* пад непасрэдным уплывам К. Маркса і Ф. Энгельса. Апубл. шэраг работ, якія, нягледзячы на дапушчаныя ў іх памылкі, адыгралі станоўчую ролю ў прапагандзе марксізма: «Эканамічнае вучэнне Карла Маркса» (1887, рус. пер. 2 выд. 1905), «Аграрнае пытанне» (1899, рус. пер. 1900) і інш. Аднак паслядоўным марксістам К. не стаў, дапускаў хістанні ў бок апартунізму, пазней пачаў рэвізаваць марксісцкую тэорыю. Аўтар антымарксісцкай тэорыі ультраімперыялізму. Выступіў супраць рэвалюц. заваявання ўлады пралетарыятам, ліквідацыі бурж. дзяржавы і ўстанаўлення дыктатуры пралетарыяту. Адышоўшы ад класавых інтарэсаў пралетарыяту, развіваў ідэі «гармоніі» класаў, «чыстай дэмакратыі». Перамогу Кастр. сацыяліст. рэвалюцыі сустрэў варожа, узначаліў барацьбу правых сацыял-дэмакратаў супраць камуніст. руху, супраць марксізма-ленінізма. Напісаў шэраг паклёпніцкіх прац пра першую краіну сацыялізма. Распрацаваў рэфармісцкую канцэпцыю «дэмакр. сацыялізма», які адмаўляе сацыяліст. рэвалюцыю, дыктатуру пралетарыяту, кіруючую ролю рабочай партыі ў класавай барацьбе і будаўніцтве сацыялізма. У. І. Ленін назваў К. рэнегатам і выкрыў яго як замаскіраванага, а таму найб. небяспечнага для рабочага руху апартуніста.

Літ.: Ленін У. І. Крах II Інтэрнацыянала, Тв., т. 21 (Полн. собр. соч., т. 26); Яго ж. Дзяржава і рэвалюцыя, Тв., т. 25 (там жа, т. 33); Яго ж. Пралетарская рэвалюцыя і рэнегат Каўцкі, Тв., т. 28 (там жа, т. 37); Адамян Г. П., К. Каутский в борьбе с материалистическим пониманием истории, М.—Л., 1934; Давидюк Г. П. Основные черты современного ревизионизма. Мн., 1961. *Г. П. Давідзюк.* Мінск.

КАЎЧУК (на мове тупі кау — дрэва, учу — цячы), высокаэластычны матэрыял з групы *высокамалекулярных злучэнняў*. Рэака павялічвае трываласць, цвёрдасць, эластычнасць ад *вулканізацыі*. Гал. прызначэнне — выраб *гумы*.

Натуральны К. (НК) ёсць у млечным соку *(латэксе) каўчуканосных раслін*; упершыню атрыманы з бразільскай гевеі ў 1738. Паводле хім. саставу НК — высокамалекулярны вуглевадарод $(C_5H_8)_n$, разглядаецца як палімер *ізапрэну*. Здабываюць у Інданезіі, В'етнаме, на Цэйлоне. Сінтэтычны К. (СК) — каўчукападобныя высокамалекулярныя злучэнні ланцуговай будовы, якія атрымліваюць у выніку палімерызацыі ці полікандэнсацыі розных манамераў: бутадыену (гл. *Бутадыенавы каўчук*), ізапрэну (гл. *Ізапрэнавы каўчук*), ізабутылену і інш. У залежнасці ад уласцівасцей і выкарыстання СК падзяляюць на 2 класы: агульнага прызначэння (для масавых вырабаў) і спец. прызначэння — з асаблівымі тэхн. уласцівасцямі: тэрмастойкасцю (напр., *крэмнійарганічны каўчук*, фторкаўчук), устойлівасцю да дзеяння бензіну, маслаў (хлорапрэнавы К.), агрэсіўных асяроддзяў (бутыл-каўчук) і інш. Дзякуючы наяўнасці такіх уласцівасцей, высокай эканамічнасці вытворчасці прамысловасць СК набыла вялікае развіццё.

Літ.: Догадкин Б. А. Химия и физика каучука, М.—Л., 1947; Кирпичников П. А., Аверко-Антонович Л. А. и Аверко-Антонович Ю. О. Химия и технология синтетического каучука, Л., 1970.

КАЎЧУКАНОСНЫЯ РАСЛІНЫ (каўчуканосы), расліны, што ўтвараюць і назапашваюць у некат. органах і тканках *каўчук*. Каля 1500 відаў, якія належаць да розных сямействаў. У прыродных умовах СССР з сям. складанакветных растуць таў-сагыз, тэка-сагыз, *кок-сагыз*, крым-сагыз, хандрыла, сумнік і інш.

К. р. падзяляюцца на латэксныя (каўчук змяшчаецца ў соку млечных сасудаў кары ці каранёў і карэнішчаў), парэнхімныя (у парэнхіме кораня і сцябла), хларэнхімныя (у зялёных клетках лісця і ў кары маладых парасткаў). Найб. прамысл. значэнне мае гевея бразільская (Hevea brasiliensis), дрэва сям. малачайных; культывуецца ў Паўд.-Усх.

Азіі, Паўн. і Цэнтр. Амерыцы, Экватарыяльнай Афрыцы, дае больш за 98% таварнага натуральнага каўчуку. З дзікарослых К. р. значэнне маюць кастылоя, фікусы (сям. тутавых), маніёт, саніум (сям. малочайных), фунтумія (сям. кутравых), гваюла (сям. складанакветных) і інш. У СССР (Казахстан, Сярэдняя Азія, Закаўказзе, Крым, Беларусь, Башкірыя, Маскоўская, Разанская і інш. вобл. РСФСР) на прамысл. мэты вырошчваліся тау-сагыз, крым-сагыз, кок-сагыз, гваюла. З асваенем прамысл. спосабу атрымання сінт. каўчуку у СССР з 1954 К. р. не культывуюцца.

Літ.: Соболевская О. Ю. и Фролов Т. В. Новое в работе с каучуконосными культурами — гевеей, гваюлой, кок-сагызом и крым-сагызом в США. «Сборник иностранной сельскохозяйственной информации», 1957, № 2; Синягин И. И. Тропическое земледелие, М., 1968.

КАЎШАРАЎ Іван Акімавіч [н. 28.10(10.11). 1911, в. Глыбоцкае Гомельскага пав. Магілёўскай губ.], Герой Сав. Саюза (1941). З сялян. Чл. КПСС з 1940. Скончыў Беліцкі с.-г. тэхнікум (1936), Ваен.-паветр. акадэмію (1945). Удзельнік сав.-фінляндскай вайны 1939—40. У Айч. вайну з 22.6.1941 на Зах., Ленінградскім, 1-м Бел. франтах — штурман авіяэскадрыллі бліскабамбардзіровачнага авіяпалка. Зрабіў 157 баявых вылетаў на знішчэнне варожых войск і тэхнікі. З вер. 1961 падпалк. К. у адстаўцы. Жыве ў Кіеве.



КАЎШОВА (Каўшы), вёска ў Харціцкім с/с Мастоўскага р-на. Цэнтр калгаса «Ленінскі сцяг». За 29 *км* на ПнЗ ад Мастоў, 44 *км* ад Гродна, 13 *км* ад чыг. ст. Чарлёна. 312 ж., гасп. 114 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. Помнік сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну.

КАЎШОЎ Віталь Дзмітрыевіч (1894, г. Златауст — 11.11.1920), удзельнік грамадз. вайны на Беларусі, узнаг. ордэнам Чырв. Сцяга (1921). З рабочых. Чл. КПСС з сак. 1917. Пасля Кастр. рэвалюцыі ў Златаусце арганізаваў чырвонагвардз. атрады і конны партыз. полк, на чале якіх змагаўся супраць белагвардзейцаў на Усх. фронце. З сак. 1919 слухач Акадэміі Ген. штаба РСЧА. У кастр. 1919 як камісар брыгады ўдзельнічаў у разгроме арміі Юдзеніча. З мая 1920 на Зах. фронце на Беларусі — нач. штаба кав. брыгады 13-й дывізіі, камандзір 28-й брыгады 10-й дывізіі. Загінуў у баях з бандамі Булак-Балаховіча. Пахаваны ў Маскве на Краснай плошчы.

Я. Ф. Шорахаў. Мінск.

КАЎШЭЛЕВА, вёска ў Ручайскім с/с Шаркоўшчынскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса імя Фрунзе. За 18 *км* на ПнУ ад Шаркоўшчыны, 236 *км* ад Віцебска, 4 *км* ад чыг. ст. Зоры. 172 ж., гасп. 59 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, магазін. Помнік 14 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

КАФЕІН (тэін, кваранін), алкалоід, 1-, 3-, 7-трыметылксанін; лякарства, якое стымулюе дзейнасць цэнтр. нерв. сістэмы. Ёсць у лісці чаю, зярнятах кавы, валоскіх арэхаў; атрымліваюць таксама сінтэтычна. Найб. ужываюць кафеін-бензаат натрыю. Выпускаюць у парашках, таблетках і растворах. Назначаюць, калі прыгнечана цэнтр. нерв. сістэма (паляпшае псіхічную і фіз. працаздольнасць), пры недастатковай дзейнасці сардэчна-сасудзістай сістэмы, спазмах сасудаў галаўнога мозгу.

КАФЕРМЕНТЫ [лац. co(n) (cum) разам, з + *ферменты*], каэнзімы, арганічныя рэчывы — небялковыя кампаненты некат. ферментаў.

Могуць аддзяляцца ад бялковай часткі ферменту. Ёсць у тканках у большасці жывёльных і раслінных арганізмаў. Многія з іх — вытворныя вітаміну В. Да К. належаць какарбаксілаза, кадэгідраза, адэнілавая к-та, кафермент А і інш.

КАФЛЯ, керамічны выраб для абліцоўкі сцен і печаў у выглядзе пліткі, вугла, часткі карніза. На тыльным баку мае выступ, каб прымацоўваць да сцяны. К. бывае гладкая ці рэльефная, з празрыстай, каляровай паліваю ці без яе, жывапісная. Узнікла на Ст. Усходзе (абліцоўка палацаў і вікуратаў Вавілона).

На Беларусі К. вядомая з 12 ст. (паліваная К. Барысаглебскай царквы ў Гродне), пашырылася з 16 ст. Пры археал. раскопках амаль ва ўсіх гарадах Беларусі знойдзена рэльефная манахромная і роспісная К. з малюнкамі кветак васількі, гронак вінограду, звяроў, птушак, родавых гербаў, з геам. арнаментам. Найб. майстэрствам вызначалася паліхромная К. з непразрыстымі белымі, сінімі, зялёна-блакітнымі, жоўтымі эмалямі. Кафля бел. майстроў, якія працавалі ў Аружэйнай палаце Крамля, шырока выкарыстоўвалася ў Маск. дзяржаве ў 17 ст. Ею аздоблены Церамны палац Крамля, Круціцкі церам, ц. Грыгорыя Неакесарыйскага ў Маскве, Васкрасенскі сабор Нова-Іерусалімскага манастыра на Істры. Асн. ўзор на К. быў раслінны (у т. л. т. зв. павінае вока). У 18 ст. ў Целяханах (Івацэвіцкі р-н Брэсцкай вобл.) вырабляўся белая гладкая і роспісная К. У канцы 19 — пач. 20 ст. вытворчасць К. набыла прамысл. характар. Кафляныя э-ды былі ў Мінску, Івянцы (гл. *Івянецкая керамі́ка*), Капылі, Копысі (гл. *Копыская кафля*), Прапойску (Слаўгарад). Многія вырабы ішлі на экспарт. У БССР абліцовачныя кафляныя плітк вырабляе Мінскі камбінат буд. матэрыялаў, паліваную К. — кафляны цэх Аршанскага камбіната сілікатных вырабаў.



Кафляны фрыз работы С. Палубеса і І. Максімава. Царква Грыгорыя Неакесарыйскага. Масква.-1669.

Літ.: Русские изразцы, Л., 1968; Овсянников Ю. Солнечные плитки, М., 1966; Елатамцава І. З гісторыі беларускай мастацкай керамікі.— Чарняўская Т. Аб дзейнасці беларускіх майстроў у Маскве ў XVII ст., у аб.: Беларускае мастацтва, в. 3, Мн., 1962. *І. М. Ялатамцава.* Мінск.

КАФТАН, мужчынская і жаночая доўгая двухбортная вопратка з падоўжанымі рукавамі. Паходзіць з усходу. Да 2-й пал. 17 ст. ў Расіі К. рознага крою і з рознага матэрыялу насілі прадстаўнікі многіх слаёў грамадства. На Беларусі найб. пашыраны К. прамога крою, з адкладным каўняром, шылі яго з сукна, паўсукна, палатна. Бытаваў да канца 19 ст.

КАХАВЕЦ Мікалай Пятровіч (н. 30.1.1924, в. Новы Двор Пінскага пав. Палескага ваяводства), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1960. У 1950—58 трактарыст, брыгадзір трактарнай брыгады Лагішынскай МТС; у 1958—63 трактарыст, з 1964 брыгадзір трактарнай брыгады калгаса «Камунар» Пінскага раёна Брэсцкай вобласці.

КАХАНАВІЧЫ, вёска ў Верхнядзвінскім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Каханавічы». За 18 *км* на ПнУ ад Верхнядзвінска, 200 *км* ад Віцебска, на аўтамаб. дарозе Верхнядзвінск — Себеж (РСФСР). 752 ж., гасп. 183 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячыя яслі-сад, бальніца, аптэка, аддз. сувязі, швейная майстэрня, сталовая, 3 магазіны. У 1943 ням.-фаш. захопнікі спалілі вёску, загубілі 96 мірных жыхароў. Брацкая магіла мірных жыхароў, якіх загубілі ням.-фаш. захопнікі, помнік сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну.

КАХАНОЎСКІ (Kochanowski) Ян (1530, в. Сыцына каля Радама — 22.8.1584), польскі паэт. З шляхты. Вучыўся ў ун-тах Кракава, Кралеўца, Падуі. У 1559 вярнуўся на радзіму. Удзельнічаў у паліт. жыцці. У 50-я г. выступіў з вершамі на лац. мове. Найб. каштоўныя творы на польскай мове, у якіх закліка ў пакінуць рэліг. спрэчкі («Згода», 1564), умацоўваць абарону краіны, правесці рэформу фінансаў, законаў, асветы («Сатыр, або Дзікі муж», 1564). Аўтар паэмы «Сцяг, або Пруская прысяга» (1569), трагедыі «Адказ грэчаскім паслам» (1578), перакладу «Псалмаў Давіда» (выд. 1578). На смерць дачкі напісаў «Трэны» (1580) — жалобныя элегіі, прасякнутыя глыбокім жалем і філас. роздумам пра жыццё і няўмольнасць законаў прыроды. «Фрашкі» (1584) — дасканалыя лірычныя мініяцюры, пераважна жартоўнага зместу, вызначаюцца трапнасцю грамадскіх і бытавых назіранняў. Асн. жанр творчасці К.— песні, лірычна прачулыя, жыццярадасныя (2 кн. выд. 1586).

Тв.: Dzieła polskie, t. 1—2, Warszawa, 1969; рус. пер.— Избр. произв., М.—Л., 1960; Лирика, М., 1970.
Літ.: Jan Kochanowski. Życie — Twórczość — Epoka, 2 wyd., Warszawa, 1962. *У. М. Казбярук.* Мінск.

КАХАР Абдула (17.9.1907, г. Каканд — 25.5. 1968), узбекскі савецкі пісьменнік. Чл. КПСС з 1952. З сям'і каваля. Вучыўся ў Сярэднеазіяцкім ун-це. Літ. дзейнасць пачаў у 1930. Майстар кароткага апавядання. У першых творах (аб. «Свет маладзее», 1933; «Апавяданні», 1935; і інш.) паказваў новае сав. жыццё, цяжкае мінулае узб. народа. Аўтар раманаў «Міраж» (1937), «Агні Кашчынара» (1946—47, 2-і варыянт асобн. выд. 1951), камедый «Шаўковае сюзанэ» («На новай зямлі», 1949, Дзярж. прэмія СССР 1952), «Хворыя зубы» (1955), «Голас з дамавіны» (1962), аповесці «Казкі пра былое» (1966). Пераклаў на узб. мову «Вайну і мір» Л. Талстога, паасобныя творы А. Пушкіна, М. Гогаля, А. Чэхава, М. Горкага. Узнаг. 4 ордэнамі, медалямі.

Тв.: Рус. пер.— Избранные произв., М., 1959; Рассказы, М., 1960; Птичка-невеличка. Рассказы и повесть, М., 1965.
Літ.: Воролина И. В. Абдулла Каххар, Ташкент, 1957.

КАХАРАЎ Абдулахад [н. 17(30).4.1913, г. Канібадам Какандскага пав. Ферганскай вобл.], савецкі дзярж. дзеяч, старшыня Савета Міністраў Тадж. ССР. З сям'і рамесніка. Чл. КПСС з 1939. Скончыў Ленінабадскі пед. ін-т (1954). З 1931 на сав., парт. рабоце. У Айч. вайну з 1942 камісар асобнага батальёна, пасля на парт. і сав. рабоце ў Ленінабадскай вобл. У 1956—61 нам. старшыні Савета Міністраў, старшыня Дзяржплана Тадж. ССР. З 1961 старшыня Савета Міністраў і міністр замежных спраў Тадж. ССР. На XXII—XXIV з'ездах КПСС выбраны канд. у чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета СССР 5—8-га скл. Узнаг. 3 ордэнамі Леніна, 5 інш. ордэнамі, медалямі.



КАХЕКСІЯ (грэч. kakós кепскі+héxis стан), паталагічны стан арганізма з агульным схудненнем, знясіленнем, слабасцю, атрафіяй, расстройствам рэгуляцыі абмену рэчываў ад парушэння функцыі нервовай і эндакрыннай сістэм.

Бывае ад злаякасных пухлін (ракавая К.), хранічных інфекц. і паразітарных хвароб (туберкулёз, малярыя і інш.), алкагалізму, атручэнняў мыш'яком, ртуццю, свінцом, галадання, расстройстваў функцыі прамежкавага мозгу і залоз унутр. сакрэцыі (гіпофіза, шчытападобнай залозы і інш.).

Літ.: Давыдовский И. В. Общая патология человека, 2 изд., М., 1969; Лаборн А. Регуляция обменных процессов, пер. с франц., М., 1970.

КАХНЕНКА Серафім Васілевіч [н. 2(15).2. 1914, в. Вербавічы Рэчыцкага пав. Мінскай губ.], беларускі савецкі іхтыёлаг. Д-р біял. н. (1968). Чл. КПСС з 1943. Скончыў БДУ (1938). Удзельнік Айч. вайны. Старшы навук. супрацоўнік Аддзела заалогіі і паразіталогіі АН БССР (з 1956). Распрацоўвае біял. асновы засялення маляўкамі вугра вадаёмаў СССР. Прапанаваў тэорыю нераставай міграцыі еўрап. вугра.

Тв.: Биология и распространение угря, Мн., 1958; Течение — главнейший фактор при миграциях европейского угря, у кн.: Экология позвоночных животных Белоруссии, Мн., 1965; Европейский угорь, М., 1969.

КАХОЎСКІ Пётр Рыгоравіч [1797, Смаленская губ.— 13(25).7.1826], дзекабрыст. З дробнамаянтковых дваран. З пач. 1825 чл. Паўночнага т-ва дзекабрыстаў. Прыхільнік ліквідацыі самадзяржаўя, знішчэння царскай

сям'і і ўстанаўлення рэсп. ладу ў Расіі. У час паўстання 14.12.1825 на Сенацкай плошчы ў Пецярбурзе заклікаў салдатаў не прысягаць Мікалаю I, забіў пецярбургскага ген.-губернатара Міларадовіча, параніў палкоўніка Сцюрлера і штабс-капітана Гастфера, якія спрабавалі супакоіць паўстанцаў. 15.12.1825 арыштаваны. У пісьмах, напісаных у час зняволення, абгрунтаваў свае паліт. погляды і даў крытычны аналіз тагачаснаму ладу Расіі. Паводле прыгавору Вярх. суда павешаны.

Літ.: Гл. пры арт. *Дзекабрысты.*

КАЦ Меер Іцкавіч (н. 14.6.1923, в. Міхайлаўка Жытомірскага пав. Валынскай губ.), гасп. дзеяч, перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1952. У 1951—57 на Віцебскім домабудаўнічым камбінаце. З 1958 старшыня калгаса імя Чырв. Арміі Віцебскага р-на. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Кастр. Рэвалюцыі, медалямі.

Тв.: Першыя крокі спецыялізацыі, Мн., 1963; Растут хлеба высокие, Мн., 1967; Трудом всего достигнешь, Мн., 1968.

КАЦАР Міхаіл Сяргеевіч [н. 25.10(7.11).1906, в. Клімавічы Сенненскага пав. Магілёўскай губ.], беларускі савецкі гісторык мастацтва. Д-р мастацтвазнаўства (1952), праф. (1956). Чл. КПСС з 1928. Скончыў Маск. ін-т гісторыі, філасофіі і л-ры (1939). Удзельнік Айч. вайны. З 1946 у АН БССР (у 1946—50 у Ін-це мовы, л-ры і мастацтва, у 1950—57 у Ін-це л-ры, у 1957—64 заг. сектара выяўл. мастацтва Ін-та мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору). У 1953—56 заг. кафедры выяўл. мастацтва Бел. тэатр.-маст. ін-та. Асн. працы па праблемах гісторыі бел. стараж. і сав. мастацтва і архітэктуры.

Тв.: Белорусская архитектура. Исторический очерк, Мн., 1956; Скульптура Савецкай Беларусі, Мн., 1957; Нарысы па гісторыі выяўленчага мастацтва Савецкай Беларусі, Мн., 1960; Изобразительное искусство Белоруссии дооктябрьского периода, Мн., 1969.

КАЦЕЛЬНІКАЎ Уладзімір Аляксандравіч [н. 24.8(6.9).1908, Казань], савецкі вучоны ў галіне радыётэхнікі. Акад. АН СССР (1953). Чл. КПСС з 1948. Скончыў Маск. энерг. інстытут (1931) і працаваў у ім выкладчыкам, з 1947 прафесар. З 1953 у Ін-це радыётэхнікі і электронікі АН СССР, з 1954 дырэктар гэтага ін-та. Навук. працы па праблеме барацьбы з перашкодамі радыёпрыёму і распрацоўцы апаратуры радыёсувязі. Распрацаваў тэорыю патэнцыяльнай перашкодаўстойлівасці. Кіруе работамі па радыёлакацыйных даследаваннях планет Венера, Меркурый і Марс. Дзярж. прэміі СССР 1943, 1946, Ленінская прэмія 1964.



Тв.: (Разам з А. М. Нікалаевым) Основы радиотехники, ч. 1—2, М., 1950—54; Теория потенциальной помехоустойчивости, М.— Л., 1956.

КАЦЁЛ ПАРАВЫ (парагенератар), цеплаабменны апарат для выпрацоўкі пары пад ціскам, вышэйшым за атмасферны; асноўная частка кацельнага агрэгата. Характарыстыкі К. п.: парапрадукцыйнасць, рабочы ціск пары, ккд, паверхня награвання. Параўтварэнне ў К. п. адбываецца ад дзеяння цяпла гарачых газаў, якія ўтвараюцца пры згаранні паліва. У СССР створаны К. п. парапрадукцыйнасцю 1600 *т/гадз* для работы ў блоку з турбінай магутнасцю 500 *Мет* і К. п. на 2500 *т/гадз* для турбіны ў 800 *Мет*.

К. п. бываюць газатрубныя і вадатрубныя. У газатрубных гарачыя газы рухаюцца па жаравых або дымагарных трубах, размешчаных у вадзе. Газатрубныя К. п. вызначаюцца малымі памерамі і досыць вялікім ккд, але іх парапрадукцыйнасць і ціск абмежаваныя. У вадатрубных К. п. гарачыя газы рухаюцца па вонкавых паверхнях трубаў, услрэдзіне якіх цыркулюе паравадзяная сумесь. Выкарыстоўваюцца на эл. станцыях вялікай магутнасці, у прамысловых, камунальных, с.-г. установах і г. д. Вадатрубныя К. п. падзяляюцца на барабанныя з натуральнай цыркуляцыяй вады і праматочныя з прымусовай цыркуляцыяй. У барабанных (гл. рыс. 1) паліва ўдзімаецца ў камеру топкі *1* і там згарае. Полымя награе ваду ў трубках, якімі пакрыты бакавыя сценкі камеры (экраны топкі), а распаленыя газы ідуць да кіпяцільных трубаў, дзе часткова ператвараецца ў пару папярэдне нагрэтая вада. Пара аддзяляецца ад вады ў барабане *2*, потым паступае ў пераперагравальнік *3* і далей у турбіну. Вада ў барабане змешваецца з сілкавальнай вадой, якая падаграецца ў эканамайзеры *4*, зноў ідзе да экранаў. Гарачыя газы выкарыстоўваюць таксама ў паветрападагравальніку *5* для награвання паветра, якое паступае ў гарэлкі катлоў разам з палівам. У праматочным К. п. (гл. рыс. 2) няма барабана, і вада з эканамайзера *1* паступае ў выпаральныя паверхні награвання *2* і *3*. У трубах гэтых паверхняў вада выпараецца поўнасцю, і пара ідзе ў пераперагравальнікі *4* і *5*. Т. ч., вада праходзіць праз увесь агрэгат без шматразовай цыркуляцыі. Адсутнасць барабана робіць котлаагрэгат больш танным, аднак яго сілкаванне патрабуе чыстай вады, з якой выдалены солі, здольныя ўтвараць накіп на паверхнях награвання. Праматочныя К. п. ўстаноўлены на самых буйных эл. станцыях Беларусі — Бярозаўскай (6 катлоў парапрадукцыйнасцю па 540 *т/гадз*, кожны ў блоку з турбінай магутнасцю 150 *Мет*) і Лукомскай (4 катлы парапрадукцыйнасцю па 950 *т/гадз*, кожны ў блоку з турбінай магутнасцю 300 *Мет*); на астатніх эл. станцыях Бел. энергасістэмы працуюць барабанныя К. п.



Рыс. 1. Прынцыповая схема барабаннага катла.



Рыс. 2. Прынцыповая схема праматочнага катла.

Літ.: Стырикович М. А., Катковская К. Я. и Серов Е. П. Парогенераторы электростанций, 2 изд., М.— Л., 1966; Резников М. И. Парогенераторные установки электростанций, М., 1968; Александров В. Г. Паровые котлы средней и малой мощности, М.— Л., 1966; Мейклляр М. В. Краткий справочник по паровым котлам электростанций, 2 изд., М., 1967.

Г. І. Хуцкі. Мінск.

КАЦІГАРОШАК (Пакацігарошак, Гарошак), казачны асілак, што парадзіўся з гарошыны і выратаваў ад змея сястру і братоў. Казкі пра К. (па міжнар. паказальніку № 312 Д) ёсць у апубл. бел. фальклорным матэрыяле ў 8, у ўкр.— у 19 і ў рус.— у 8 запісах. Часам трапляюцца ў літоўскіх, славацкіх, башк. зборніках.

Гіпербалізаваны паказ магутнасці К. ярка спалучацца з гумарыстычным бытавым каларытам і сац. завостранасцю гэтага вобраза ў шэрагу ўкр. і бел. варыянтаў. Бел. казачнікам характэрная трактоўка вобраза К. як нар. заступніка.

Літ.: Бараг Л. Р. Беларуская казка, Мн., 1969: яго ж. Об особенностях украинской сказочной героики сравнительно с белорусской и русской, «Русский фольклор», 1968, в. 11.

КАЦІРОЎКА (ад франц. coter азначаць), 1) вызначэнне курсу замежнай валюты. У капіталіст. краінах разам з афіцыйнай К. існуе неафіцыйная. У СССР курс рубля ў замежнай валюце вызначае Дзяржбанк, які перыядычна публікуе бюлетэні курсаў замежных валют у рублях. 2) У капіталіст. краінах — вызначэнне курсаў каштоўных папер (акцый) на фондавай біржы.

КАЦМАН Яўсей Хаімавіч [3(15).11.1893, ст. Бабровіца Казяльецкага пав. Чарнігаўскай губ.— 29.10.1970], беларускі савецкі вучоны ў галіне педыятрыі. Д-р мед. н. (1956), праф. (1962). Скончыў Кіеўскі мед. ін-т (1921). Удзельнік Айч. вайны. Працаваў у НДІ аховы мацярынства і дзяцінства (1921—38), на кафедры педыятрыі Мінскага мед. ін-та (1938—68). Асн. працы па пытаннях лячэння і прафілактыкі дзіцячых хвароб. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.

Тв.: Рэўматызм у дзяцей, Мн., 1949; Аскарыдоз жоўчных путей у детей, у кн.: В помощь педиатру и акушеру-гинекологу, Мн., 1953; Коклюш, Мн., 1959.

КАЦЭБУ Ота Яўстафіевіч [19(30).12.1788, Рэвель — 3(15).2.1846], рускі мараплавец. У 1803—06 удзельнічаў у кругасветным плаванні І. Ф. Крузенштэрна. У 1815—18 кіраваў экспедыцыяй, якая адкрыла астравы ў архіпелагу Туамоту, у градзе Маршалавых а-воў, заліў на З Аляскі, правяла важныя акіянаграфічныя работы. У 1823—26 узначаліў кругасветную экспедыцыю, якая адкрыла астравы ў арх. Туамоту, Самоа і інш. Імя К. носяць заліў і нас. пункт на Аляскі.

Тв.: Путешествие вокруг света, 2 изд., М., 1948; Новое путешествие вокруг света в 1823—1826 гг., М., 1959.

КАЦЭНБОГЕН Саламон Захаравіч [10(22).5.1889, Мінск — 1.9.1946], беларускі савецкі філосаф, эканаміст, юрыст. Праф. (1921). Чл. КПСС з 1920. Скончыў эканам. ф-т Кіеўскага ун-та (1911), юрыд. ф-т Пецярбургскага ун-та (1916). У 1920—21 нарком сац. забеспячэння БССР. У 1921—25 праф. кафедры сацыялогіі і першабытнай культуры, нам. рэктара, дэкан ф-та грамадскіх навук БДУ. З 1925 на выкладчыцкай рабоце ў Саратаўскім, Уральскім ун-тах, Ленінградскім, Свярдлоўскім пед. ін-тах. Працы па праблемах марксісцка-ленінскай філасофіі і сацыялогіі. Чл. ЦВК БССР 2—4-га скл. (1920—24).

КАЦЮБІНСКІ Міхайла Міхайлавіч [5(17).9.1864, Вінніца — 12(25).4.1913], украінскі пісьменнік. Сын дробнага чыноўніка. Скончыў Шаргарадскае духоўнае вуч. (1880). За сувязь з нарадавольцамі ў 1882 арыштаваны. З 1891 настаўнічаў у вёсцы, збіраў укр. фальклор, распаўсюджваў забароненую л-ру. Працаваў у філаксернай камісіі ў Бесарабіі (1892—95), Крыме (1895—97). У 1898—1911 справавод земскай управы ў Чарнігаве. Тройчы (1909—11) лячыўся за мяжою (Германія, Аўстрыя, Швейцарыя, Італія). На в-ве Капры пазнаёміўся (1909) і пасябраваў з М. Горкім (у пісьме да К. 20.11.1910 М. Горкі высока ацаніў літ. дзейнасць Я. Купалы і Я. Коласа), у 1910 пазнаёміўся з У. І. Леніным. Друкаваўся з 1890. У ранняй творчасці шмат апавяд. для дзяцей («Харыця», «Ялінка», 1891, і інш.), у якіх рэалістычна паказаў бязрадаснае маленства дзяцей беднаты. Адлюстраваў бяспраўнасць народа і яго імкненне да волі («На крылах песні», 1895; «Дарагою цаною», 1901). Ганьбаваў самадзярж. лад, фарысейства лібералаў, рэнегацтва ў палітыцы, бараніў бедных («Папомсціўся», 1893; «Смех», 1906; «Persona grata», 1908; «Коні не пінаваты», «Падарунак на імяніны», 1912). У глыбокагуманіст. творах «У путах шайтана» (1899), «На камені» (1902), «Пад мінарэтамі» (1905) выкрывае рэлігію. Аповесць «Fata morgana» (ч. 1—2, 1904—10) — эпапея рэвалюц. барацьбы сялянства ў 1905—07. Тут упершыню ў укр. л-ры намаляваў вобраз рабочага-рэвалюцыянера. Гуманізмам прасякнута аповесць «Цені забытых продкаў» (1912). Шчыры лірызм, паглыблены псіхалагізм, рамант. паэтызацыя станоўчага героя — асн. рысы творчасці К. Творы К. перакл. на многія мовы народаў СССР і за мяжою. У Вінніцы (з 1927) і Чарнігаве (з 1934) літ.-мемарыяльныя музеі К.



Тв.: Твори, т. 1—6, Київ, 1961—62; бел. пер.— Нюрэнбергскае яйка, Мн., 1939; рус. пер.— Собр. соч., т. 1—4, М., 1965.

Літ.: Колесник П.. Коцюбинський — художник слова, Київ, 1964; Калениченко Н. Великий сонцепоклонник, Київ, 1967; Коцюбинская И. Михаил Коцюбинский, М., 1969; Куп'янський И. Літопис життя і творчості Михайла Коцюбинського, Київ, 1965; Бузук П. Ад інтэлігенцыі да народа, «Полымя», 1926, № 8; Стэбун І. Міхаіл Кацюбінскі, «Полымя рэвалюцыі», 1938, № 7—8; Михайло Коцюбинський. Бібліогр. покажчик, Київ, 1964.

І. У. Саламевіч. Мінск.

КАЦЯМЯТКА (Nepeta), род адна- і шматгадовых травяністых раслін сям. губакветных. Каля 250 відаў, пашыраных у Еўропе і Азіі. У СССР 82 віды, на Беларусі адзін — К. каціная мята (N. cataria, нар. назвы: лясная, каціная мята, мяліца).

Сцябло К. галінастае, апушанае, выш. да 100 см. Лісце трохвугольна-ланцэтападобнае, пілаватае. Кветкі белыя або светла-ружовыя ў густых коласападобных суквецціях. Расце ў лясах, хмызняках, на пустках. Меданосная і эфіраалейная расліна, ужываецца ў нар. медыцыне. Культурная форма гэтага віду — N. c. var citriodora з моцным пахам лімона, вырошчваецца на Украіне для парфумернай і харч. прамысловасці.


Кацямятка каціпал.

Літ.: Иванова Б. И. и Шаворская Т. А. Пряноароматические растения для производства вермута, ликеров и настоек. Кишинев, 1963; Флора БССР, т. 4, Мн., 1955.

КАЦЯРЫНА І Аляксееўна [5(15).4.1684—6(17).5.1727], імператрыца ўсерасійская [1725—27]. З сям'і літ. селяніна С. Скаўронскага; да прыняцця праваслаўя Марта Скаўронская (паводле інш. звестак Весялеўская). У Паўн. вайну 1700—21 трапіла ў палон да рускіх. З 1703 жонка Пятра I (царкоўны шлюб аформлены ў 1712). У 1724 каранаваная. Пасля смерці Пятра I узведзена на трон гвардз. палкамі на чале з А. Д. Меншыкавым, які фактычна стаў кіраваць дзяржавай. К. I дзярж. справамі не займалася. У яе цараванне створаны Вярх. тайны савет (1726—30). Ад шлюбу з Пятром I дочкі Ганна і Лізавета (гл. *Лізавета Пятроўна*).

Літ.: Соловьев С. М. История России с древнейших времен, кн. 9 (т. 17—18)—10 (т. 19—20), М., 1963.

КАЦЯРЫНА ІІ Аляксееўна [сапр. Софія Фрэдэрыка Аўгуста Ангальт-Цэрбскцкая; 24.4(5.5).1729, Шчэцін — 6(17).11.1796], імператрыца ўсерасійская [1762—96]. З беднага ням. княскага роду. З 1745 жонка *Пятра III*. 28.6.1762 пры дапамозе гвардыі зрабіла дварцовы пераварот і захапіла ўладу. Вяла актыўную ўнутр. і знешнюю палітыку, па класавай накіраванасці — дваранскую, якая ў 60-я г. прыкрывалася дэмагагічнымі і ліберальнымі прыёмамі т. зв. «асветнага абсалютызму». Перапіска з франц. асветнікамі, стварэнне камісіі для падрыхтоўкі рэформаў у 1767 памаглі К. ІІ заваяваць аўтарытэт у грамадскіх колах Расіі і Зах. Еўропы. Пры ёй створана *Вольнае эканамічнае таварыства* (1765); для ўпарадкавання і пашырэння памешчыцкага землеўладання распачата генеральнае межаванне (1766); указы аб правах дваран высылаць сялян на катаргу (1765) і аб забароне сялянам скардзіцца на памешчыкаў (1767) замацавалі ўладу памешчыкаў над сялянамі. Раздала дваранам больш за 400 тыс. прыгонных сялян, 800 тыс. дзесяціны зямель, у т. л. і на Беларусі (гл. *Дваранства*). Узмацненне прыгоніцтва і цяжкія падаткі, выкліканыя войнамі, абвастрылі класавыя супярэчнасці. Гэта прывяло да *сялянскай вайны пад кіраўніцтвам Е. І. Пугачова 1773—75*, пасля задушэння якой палітыка К. ІІ стала больш рэакцыйнай. Губернская рэформа 1775, *даравальная грамата дваранству 1785, даравальная грамата гарадам 1785* замацавалі ўладу дваран і бюракратычны апарат кіравання. Узмацніліся ганення па прадстаўнікоў перадавой думкі — М. І. Навікова, А. М. Радзішчава і інш. У выніку войнаў з Турцыяй (1768—74 і 1787—91; гл. *Руска-турэцкія войны* 18—19 ст.) ліквідавана небяспека тур. агрэсіі, далучаны да Расіі паўд. р-ны Украіны, Крым (1783). У выніку 3 падзелаў Рэчы Паспалітай да Расіі ў 1772 адышлі Латгалія і Усх. Беларусь па Зах. Дзвіне — Друці — Дняпры, у 1793 — Цэнтр. Беларусь і Правабярэжная Украіна, у 1795 — Літва, Курляндыя, Зах. Беларусь і Зах. Валынь. У час франц. бурж. рэвалюцыі 1789—94 Расія ўключылася ў кааліцыю еўрап. рэакц. дзяржаў супраць Францыі. Літ. і публіцыст. дзейнасць К. ІІ служыла паліт. і ідэалаг. задачам дваранскай дзяржавы.

Літ.: Ключевский В. О. Соч., т. 5, ч. 5, М., 1958; Соловьев С. М. История России с древнейших времен, кн. 13 (т. 25—26) — кн. 15 (т. 29), М., 1965—66; История СССР с древнейших времен до наших дней. Первая серия, т. 3. М., 1967 (бібліягр.). *В. С. Паваліхіна.* Мінск.

КАЦЯШ Гаўрыла Іванавіч [н. 25.3(7.4).1904, Магілёў], гасп. дзеяч, перадавік чыгуначнага транспарту, Герой Сац. Працы (1959). Чл. КПСС з 1939. У 1919—30 на Магілёўскай дыстанцыі сувязі Маскоўска-Беларуска - Балтыйскай чыгункі: тэлеграфіст, пам. нач. ст. Магілёў. У 1944—51 нач. Зах. чыгункі, у 1951—53 нач. Мінскай, у 1953—69 нач. Бел. чыгункі. З 1969 саветнік К-та Арг-цыі міжнар. супрацоўніцтва чыгунак (ПНР). Дэп. Вярх. Савета СССР 2, 4—5-га скл., Вярх. Савета БССР 3, 6—7-га скл. На XXV і XXVI з'ездах КПБ выбраны чл. ЦК. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, 4 інш. ордэнамі, медалямі.



Тв.: Стальныя магістралі рэспублікі. Мн., 1957.

КАЧАЛАЎ (сапр. Шверубовіч) Васіль Іванавіч [30.1(11.2).1875, Вільня — 30.9.1948], рускі савецкі акцёр. Нар. арт. СССР (1936). Беларус па паходжанні. З 1900 у трупе МХАТа. Акцёр шырокага творчага дыяпазону. Мастацтва К. вызначалася сілаю думкі, глыбокім трагізмам, майстэрствам пераўвасаблення, псіхал. і жыццёваю дакладнасцю, грамадзянскай накіраванасцю. Дасягаў вял. філасофскіх абагульненняў, стварыў сацыяльна значныя і тыповыя вобразы. Вял. месца ў яго рэпертуары займала драматургія А. Чэхава, М. Горкага. Лепшыя ролі: Трафімаў, Тузенбах («Вішнёвы сад», «Тры сястры» А. Чэхава), Барон, Захар Бардзін («На дне», «Васа» М. Горкага), Чацкі («Гора ад розуму» А. Грыбаедава), Гамлет, Юлій Цэзар (аднайм. п'есы У. Шэкспіра), Іван Карамазаў («Браты Карамазавы» паводле Ф. Дастаеўскага), Ад аўтара («Уваскрэсенне» паводле Л. Талстога), Вяршынін («Браняпоезд 14—69» У. Іванава). Майстар маст. слова. Стварыў жанр эстраднага выканання драм. твораў, т. зв. мантажы, дзе выконваў некалькі роляў. Дзярж. прэмія СССР 1943. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.



Літ.: В. И. Качалов. Сб. статей, воспоминаний, писем. М., 1954; Виленкин В. Я. Качалов. М., 1962; Чушкин Н. Н. Гамлет — Качалов, М., 1966.

КАЧАН Уладзімір Лявонавіч [н. 14(27).8.1914, в. Крыжы Лепельскага пав. Віцебскай губ.], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Віцебскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1940. Скончыў Маскоўскае ваен.-паліт. вуч. (1941), ВПШ пры ЦК КПСС (1959). З 1932 на пед. рабоце. З вер. 1941 сувязны партыз. атрада Дубава. У партызанах з вер. 1942 — пам. нач. штаба, пам. камісара партыз. брыгады Чашніцкай («Дубава»), з крас. 1944 камісар *партызанскай брыгады Лепельскай*, з крас. 1943 адначасова другі сакратар Лепельскага падпольнага РК КП(б)Б. Пасля вайны сакратар Лепельскага, Лёзненскага райкомаў КПБ, старшыня Аршанскага райвыканкома, у Віцебскім абкоме КПБ. Дэп. Вярх. Савета БССР 4-га і 5-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Кастр. Рэвалюцыі, 3 інш. ордэнамі, медалямі. Жыве ў Віцебску.

КАЧАНАЎ Яўген Іванавіч (20.8.1915, в. Доўгавічы Мсціслаўскага пав. Магілёўскай губ.— 28.1.1945), Герой Сав. Саюза (1945). У Чырв. Арміі з 1939. У Айч. вайну з 1942 на Крымскім, Цэнтр. і 1-м Укр. франтах — сяржант, камандзір стралк. аддзялення. Вызначыўся ў баях за Одру (Одэр). 27.1.1945 з аддзяленнем першы фарсіраваў раку і вёў бой за расшырэнне плацдарма. Паранены не пакінуў поля бою. 28.1.1945 асабістым прыкладам падняў байцоў стралк. падраздзялення ў атаку. Загінуў у гэтым баі.



КАЧАНОВІЧЫ, вёска ў Пінскім р-не Брэсцкай вобл., на правым беразе Прыпяці. Цэнтр сельсавета. За 24 *км* на У ад Пінска, 199 *км* ад Брэста, 17 *км* ад чыг. ст. Парахонск, 13 *км* ад прыстані Беразцы на р. Прыпяць. 273 ж., гасп. 80 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі, магазін.

КАЧАРГА Васіль Міхайлавіч [н. 1(14).10.1904, в. Харашэвічы Слонімскага пав. Гродзенскай губ.], перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1949). У 1940—46 рабочы, з 1946 да 1968 звеннявы па вырошчванні насення канюшыны саўгаса «Вольна-Чэрніхава» Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл. Жыве ў в. Вольна гэтага раёна.

КАЧАРГА Іван Антонавіч [24.9(6.10).1881, мяст. Носаўка Чарнігаўскай губ.— 29.12.1952], украінскі савецкі драматург. Засл. дз. маст. УССР (1950). Сын чыгуначніка. Скончыў Кіеўскі ун-т (1903). Друкаваўся з 1904. Першая п'еса — драм. казка «Песня ў келіху» (нап. 1910). Часы прыгону паказаў у камедыі «Фея горкага міндалю» (1926), падзеі рэвалюцыі і грамадз. вайны — у сатыр. камедыі «Марка ў пекле» (нап. 1928). У 1928—31 пісаў п'есы пра калектывізацыю, барацьбу з кулацтвам («Павук у калгасе», «Пра што жыта спявае»). Найб. значны твор — драм. паэма «Свеччына вяселле» («Песня пра Свечку», 1931). Аўтар п'ес «Майстры часу» («Гадзіншчык і курыца», 1934, паст. Беларускім трэцім дзярж. драм. т-рам 1935), «Экзамен па анатоміі» (апубл. 1946), «Ісціна» (нап. 1948, апубл. 1956); драм. паэм «Яраслаў Мудры» (нап. 1944, апубл. 1946), «Прарок» (нап. 1948, апубл. 1956). Творам К. характэрныя філас. напоўненасць, паглыбленая цікавасць да маральна-этычных праблем. Узнаг. 2 ордэнамі Прац. Чырв. Сцяга.

Тв.: Твори, т. 1—3, Київ, 1956; рус. пер.— Исторические драмы, М., 1954.

Літ.: Сторчак К. М. Драматургія Івана Кочерги, Київ, 1957; Андріанова Н. М. Іван Кочерга, Київ, 1963; Кузякіна Н. Драматург Іван Кочерга. Київ, 1968.

КАЧАРОЎСКІ Моўша-Хаім Шлёмавіч [н. 22.11(5.12).1910, Хойнікі Рэчыцкага пав. Мінскай губ.], гасп. дзеяч, Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1943. У 1948—53 аграном саўгаса «Брылёва», з 1953 старшыня калгаса імя Мікаяна (з 1957 калгас «Перамога») Гомельскага р-на. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, ордэнам Кастр. Рэвалюцыі, медалямі.

КАЧАТКОВА Ганна Васілеўна [н. 26.8(8.9).1911, в. Канаеўка Нікалаеўскага пав. Самарскай губ.], руская савецкая актрыса. Засл. арт. БССР (1949). Скончыла Саратаўскае тэатр. вучылішча імя Слонава (1934). Працавала ў т-рах РСФСР. У 1942—43 у франтавой тэатр. брыгадзе. З 1945 у Магілёўскім т-ры, з 1949 у Брэсцкім т-ры імя ЛКСМБ. Востраха-рактарная, камедыйная актрыса. Найб. значныя ролі: Паўла, Шурка («Зыкавы», «Ягор Булычоў і іншыя» М. Горкага), Аркадзіна («Чайка» А. Чэхава), Купавіна («Ваўкі і авечкі» А. Астроўскага), мадам Абломак («Юнацтва бацькоў» Б. Гарбатава), Яравая («Любоў Яравая» К. Траніёва), Марыя Аляксандраўна («Слм'я» І. Папова), Сэвідж («Дзіўная місіс Сэвідж» Дж. Патрыка), Дульская («Мараль пані Дульскай» Г. Запольскай), Калеснікава («Брэсцкая крэпасць» К. Губарэвіча), Паліна («Трыбунал» А. Макаёнка).

КАЧАТКОЎ Рыгор Аляксеевіч [19.1(1.2).1904, в. Шмялёўка Спаскага пав. Казанскай губ.— 15.10.1968], рускі савецкі акцёр. Нар. арт. Узб. ССР (1946), нар. арт. БССР (1954). Скончыў Яраслаўскае тэатр. вучылішча. Працаваў у т-рах РСФСР. З 1950 у Рускім т-ры БССР імя М. Горкага. Праўдзівасць, лаканічнасць і прастата, арганічнасць сцэн. паводзін

уласцівыя творчасці К. Выконваў драм. і характарныя ролі. Найб. значныя: Гадун («Разлом» Б. Лаўранёва), Забродзін («Ленінградскі праспект» І. Штока), Сіплы («Аптымістычная трагедыя» У. Вішнеўскага), Фаюнін («Нашэсце» Л. Лявонава); у класічным рэпертуары — граф Кент («Кароль Лір» У. Шэкспіра), Ягор Булычоў, Цыганоў («Ягор Булычоў і іншыя», «Варвары» М. Горкага), Мітрыч («Улада цемры» Л. Талстога). У п'есах бел. аўтараў — Калеснікаў, Карнілаў («Брэсцкая крэпасць», «Галоўная стаўка» К. Губарэвіча), Чарнуха («Што пасееш, тое і пажнеш» В. Палескага), Траян («Пад адным





Р. А. Качаткоў у ролях Сіплага (злева) і Траяна (сцэна са спектакля).

небам» А. Маўзона). У 1962—67 педагог Бел. тэатр.-маст. ін-та. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга.

Літ.: Грыгор'ева А. У росквіце творчых сіл, у кн.: Майстры беларускай сцэны, Мн., 1960. *К. Дз. Гусеў.* Мінск.

КАЧКАНОС, млекакормячая жывёла атр. *аднапраходных.*

КАЧКІ, качыныя (Anatinae), падсямейства вадаплаўных птушак атр. *гусепадобных.* 112 відаў, пашыраных амаль на ўсёй зямлі. У СССР 41 від, на Беларусі 21.

Маса птушак 280 *г* — 2,5 *кг.* Шыя адносна кароткая. К. уласцівы добра вызначаны полавы дымарфізм, асабліва ў перыяд размнажэння. Вольшасць К. пералётныя. Кормяцца раслінным і жывёльным кормам. Паводле прамысл. значэння падзяляюцца на 3 групы: сапраўдныя К., *нырцы* і *крахалі.* Сапраўдныя К. гняздуюцца па берагах рэк, азёраў, на балотах. На Беларусі — *крыжанка,* чырок-свістун, чырок-траскун (гл. *Чыркі*), *шэрая качка, шыраканоска, шылахвостка* і інш. Аб'ект промыслу і спарт. паляванння.



Шэрая качка.

Літ.: Федюшин А. В. и Долбик М. С. Птицы Белоруссии, Мн., 1967 (бібліягр.); Жизнь животных, т. 5, М., 1970.

КАЧКІ СВОЙСКІЯ, птушкі атр. гусепадобных. Паходзяць ад дзікіх качак *крыжанак,* прыручаных у старажытнасці. К. с. плодныя, скараспелыя, даюць смачнае і пажыўнае мяса. Яйцы выкарыстоўваюцца для інкубацыі, у харч. прамысловасці (яечны парашок, меланж, кандытарскія вырабы).



Жлобінскія качкі.

Сярэдняя маса качкі 3—3,5 *кг,* качара 3,5—4, качаняці (у 50 дзён) 2—2,8 *кг.* Ад адной качкі за год можна атрымаць больш за 130 качанят і да 300 *кг* мяса (у жывой масе). К. с. пачынаюць несціся ва ўзросце 160—180 дзён, за год даюць больш як 200 яец. Маса яйца 85—95 *г.* Сярэдняя працягласць племянога выкарыстання 2, максімальная 4—5 гадоў. На Беларусі найб. пашыраны пекінская парода К. с. і качкі жлобінскай папуляцыі, атрыманыя ў саўгасе «Жлобін» Гомельскай вобл. скрыжаваннем пекінскіх з белымі маскоўскімі качкамі. Гэтыя качкі добра прыстасоўваюцца да інтэнсіўнага метаду трымання і кармлення (без вадаёмаў). Выхад выпатрашанай тушкі 58—60%, тлушчу ў мясе 24—30%.

Літ.: Интенсивное утководство, М., 1963; Налібоцкі С. Б. і Нікалаева Ю. Н. Племянная птушкагадоўля, Мн., 1960. *В. М. Галушка.* Жодзіна.

КАЧКОЎ Пётр Васілевіч [н. 29.6(12.7).1909, в. Мураўёва Каргапальскага пав. Алонецкай губ.], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Мінскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1938. Скончыў Саратаўскую паграншколу (1936), ВПШ пры ЦК КПБ (1953). З 1927 рабочы. З 1931 у Чырв. Арміі — пагранічнік, камандзір батальёна. У партызанах з чэрв. 1942 — радавы, камандзір групы, атрада; з мая 1944 камандзір *партызанскай брыгады 32-й* імя М. І. Калініна Мінскай вобл. Пасля вайны на парт. і сав. рабоце. Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі. Жыве ў Іўі.

КАЧУБІНСКІ Аляксандр Аляксандравіч [22.10(3.11).1845, Кішынёў — 15(28).5.1907], рускі вучоны-славіст і гісторык. Чл. Чэшскай АН (з 1899). Скончыў Маскоўскі ун-т (1867), з 1877 праф. Новарасійскага (Адэскага) ун-та. Навук. працы «Да пытання пра ўзаемаадносіны славянскіх гавораў» (т. 1, 1877), «Вынікі славянскай і рускай філалогіі» (1882) прысвечаны пытанням узаемасувязі слав. моў і культур; «Тэрыторыя дагістарычнай Літвы» (1897) — этн. гісторыі беларусаў і літоўцаў.

Літ.: Ляпунов Б. М., А. А. Кочубинский и его труды по славянской филологии, Одесса, 1909. *М. І. Ермаловіч.* Маладзечна.

КАЧУРА Іван Міхайлавіч [н. 24.7(6.8).1902, в. Турын Ігуменскага пав. Мінскай губ.], беларускі сав. эканаміст. Чл.-кар. АН БССР (1950). Чл. КПСС з 1928. Скончыў Бел. с.-г. акадэмію (1930). Удзельнік Айч. вайны. З 1947 дырэктар Ін-та эканомікі АН БССР, з 1951 дырэктар Гродзенскага с.-г. ін-та. У 1957—69 дырэктар, з 1969 ст. навук. супрацоўнік і навук. кансультант Бел. НДІ эканомікі і арг-цыі с.-г. вытворчасці. Навуковыя

працы па арг-цыі і аплаце працы, укараненні гасп. разліку, эфектыўнасці выкарыстання тэхнікі ў калгасах. Узнагароджаны 2 ордэнамі, медалямі.



Тв.: Новые формы организации и оплаты труда в колхозах Белорусской ССР, у аб.: Новое в организации и оплате труда в колхозах, М., 1957; Опыт применения прогрессивных форм основной и дополнительной оплаты труда в колхозах Белорусской ССР, у аб.: Опыт применения прогрессивных форм оплаты труда в колхозах, М., 1963; (у сааўт.) Системы ведения сельского хозяйства Белорусской ССР, Мн., 1970.

КАЧУРЫНА, вёска ў Машанацкім с/с Магілёўскага р-на, на р. Рудзея. Цэнтр калгаса імя Ільіча. За 15 *км* на У ад Магілёва, 12 *км* ад чыг. ст. Лупалава, каля аўтамаб. дарогі Магілёў — в. Расна (0,5 *км*). 169 ж., гасп. 63 (1971). Лесапільня, млын, мех. майстэрня, адз. сувязі. У чэрв. 1944 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі. Брацкая магіла сав. воінаў Айч. вайны.

КАЧЫНЯН Антон Эрвандавіч [н. 12(25).10.1913, в. Шагалі Барчалінскага пав. Тыфліскай губ.], савецкі парт. і дзярж. дзеяч, першы сакратар ЦК КП Арменіі. З сялян. Чл. КПСС з 1938. Скончыў Вышэйшую камуніст. с.-г. школу ў Ерэване (1935), Вышэйшую школу партарганізатараў пры ЦК ВКП(б) (1946), ВПШ пры ЦК КПСС (1959). У 1935—39 на газетнай, камсамольскай рабоце. У 1939—41 сакратар, першы сакратар ЦК ЛКСМ Арменіі. У 1941—43 сакратар Кіраўскага райкома партыі Ерэвана, з 1943 першы сакратар Котайкскага РК КП(б) Арменіі. У 1946—52 сакратар ЦК КП(б) Арменіі, першы сакратар Ерэванскага акр. к-та КП(б) Арменіі. З ліст. 1952 старшыня Савета Міністраў Арм. ССР, з лютага 1966 першы сакратар ЦК КП Арменіі. На XXII з'ездзе КПСС выбраны канд. у чл. ЦК, на XXIII, XXIV — чл. ЦК. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР 3—8-га скл. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі.



КАЧЭУНІЦТВА, спосаб жыцця некат. народаў свету, які ўзнік у час першага грамадскага падзелу працы, выдзялення жывёлагадоўчых плямёнаў і звязаны з іх вытворчай дзейнасцю. Першы значны грамадскі падзел працы паміж земляробамі і жывёлаводамі адбыўся ў эпоху бронзы сярод часткі насельніцтва стэпаў і пустынь.

Вядомыя тры асн. тыпы качавання: «мерыдыянальны», калі маршруты перамяшчэння статкаў (звычайна з Пн на Пд і назад) дасягалі болей за 1000 км, напр. у казахаў. У горных краінах качавалі ў «вертыкальным» кірунку з стэпавых далін да альпійскіх лугоў і назад (кіргізы). У пустынях качавалі па замкнёных цыклічных кругах непадалёку ад калодзежаў і аазісаў. У дарэвалюц. Расіі К. існавала ў некат. народаў Сярэдняй Азіі, Сібіры, Каўказа і інш. як вынік іх эканамічнай і культурнай адсталасці. У СССР як сацыяльна-эканамічная з'ява ліквідавана. *Дз. Д. Супрун.* Мінск.

КАШАВАРАВА-РУДНЕВА Варвара Аляксандраўна [каля 1844, г. Чавусы Магілёўскай губ.— 29.4(11.5).1899], рускі ўрач акушэр-гінеколаг, першая ў Расіі жанчына, якая атрымала вучоную ступень д-ра медыцыны (1876). Скончыла Пецярбургскую медыка-хірург. акадэмію (1868). Займалася навук. і практ. дзейнасцю ў Пецярбургу (1868—81) і ў Варонежскай губ. (1881—99). Удзельніца руху (60-я г. 19 ст.) за разняволенне жанчын. Асн. працы па паталагічнай анатоміі жаночых палавых органаў, гігіене жанчын і гісторыі мед. адукацыі ў Расіі.

Тв.: Материалы для патологической анатомии маточного влагалища, СПб., 1876 (Дыс.).

Літ.: Дионесов С. М., В. А. Кашеварова-Руднева — первая русская женщина — доктор медицины, М., 1965.

КАШАВОЙ Алег Васілевіч (падпольны псеўданім Кашук; 8.6.1926, г. Прылукі УССР — 9.2.1943), адзін з кіраўнікоў падпольнай камсамольскай арг-цыі *«Маладая гвардыя».* Герой Сав. Саюза (1943). Чл. ВЛКСМ. Арганізатар і кіраўнік шматлікіх баявых аперацый. З раскрыццём арг-цыі спрабаваў перайсці лінію фронту, 26.1.1943 схоплены фашыстамі на ст. Картушына і пасля катаванняў расстраляны каля г. Равянькі. Пасля вызвалення горада Чырв. Арміяй пахаваны ў брацкай магіле на цэнтр. плошчы ў Равяньках. Яго імем названы шахты, калгасы, школы, многія піянерскія дружыны.

Літ.: Кошевая Е. Повесть о сыне, М., 1968; Фадзееў А. Маладая гвардыя, Мн., 1953.

КАШАВОЙ Пётр Кірылавіч [н. 25.11(8.12).1904, г. Александрыя Херсонскай губ.], савецкі ваенны дзеяч. Маршал Сав. Саюза (1968). Двойчы Герой Сав. Саюза (1944, 1945). З сялян. Чл. КПСС з 1925. Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1939), Вышэйшыя акадэмічныя курсы (1948). У Чырв. Арміі з 1920. Удзельнік грамадз. вайны на Украіне супраць польскіх інтэрвентаў і белагвардзейцаў. Потым на камандных пасадах у Чырв. Арміі. У Айч. вайну на Волхаўскім, Сталінградскім, Паўд., 4-м Укр. і 3-м Бел. франтах — камандзір стралк. дывізіі, корпуса. Удзельнік вызвалення Данбаса, Крыма, Беларусі (Віцебска, Магілёва, Бабруйска, Оршы, Барысава, Мінска), Усх.-прускай аперацыі. У 1945—57 першы нам. галоўнакамандуючага, у 1965—69 галоўнакамандуючы групы сав. войск у Германіі. У 1957—65 камандуючы войск ваен. акруг. З 1969 у Мін-ве абароны СССР. На XXII і XXIII з'ез-



дах КПСС выбраны канд. у чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета СССР 6-га і 7-га скл. Узнаг. 5 ордэнамі Леніна, 7 інш. ордэнамі, медалямі, 6 ордэнамі замежных краін.

Літ.: Люди бессмертного подвига, кн. 1, 2 изд., М., 1965, с. 408—413.

КАШАЛЁВА, вёска ў Навагрудскім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Кутузава. За 9 *км* на ПдЗ ад Навагрудка, 176 *км* ад Гродна, 13 *км* ад чыг. ст. Наваельня, на аўтамаб. дарозе Навагрудак — г. п. Наваельня. 626 ж., двароў 150 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, сталовая, 2 магазіны. Помнік на брацкай магіле 58 сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны.

КАШАЛЁЎ, вёска ў Буда-Кашалёўскім р-не Гомельскай вобл., на р. Ліпа. Цэнтр сельсавета. За 5 *км* на ПнУ ад Буда-Кашалёва, 53 *км* ад Гомеля, на аўтамаб. дарозе Буда-Кашалёва — Чачэрск. 494 ж., гасп. 174 (1971). Маслазавод. 8-гадовая школа, клуб, б-ка, дзіцячы сад, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін.

КАШАЛІ, вёска ў Каралінскім с/с Зэльвенскага р-на Гродзенскай вобл., на левым беразе р. Зальвянка. Цэнтр калгаса «Новае жыццё». За 14 *км* на ПдУ ад Зэльвы, 146 *км* ад Гродна. 422 ж., двароў 139 (1971). Пач. школа, клуб, магазін.

КАШАЛОТ, млекакормячая жывёла падатрада *зубатых кітоў*.

КАШАНКА, рака, левы прыток Проні (бас. Дняпра). Даўж. 39 *км*. Цячэ ў Мсціслаўскім і Чавускім р-нах Магілёўскай вобл. Вадазбор (146 *км*²) у межах паўд. схілаў Смаленскага ўзв., у сярэдняй і ніжняй частках аблесены. Рэльеф дробнаўгорысты, парэзаны ярамі. Жыўленне мяшанае. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 0,5 *м*³/*сек*.

КАШАРА, вёска ў Дварэцкім с/с Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр калгаса «Ленінскае жыццё». За 18 *км* на З ад Рагачова, 139 *км* ад Гомеля. 232 ж., гасп. 70 (1971). Лясніцтва, васьмігадовая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі, магазін.

КАШКАДАР'ІНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ, на Пд Узбекскай ССР. Утворана 7.2.1964. Пл. 28,4 тыс. *км*². Нас. 828 тыс. чал. (1971). Падзяляецца на 9 раёнаў; 2 гарады, 4 гар. пасёлкі. Цэнтр г. Каршы.



Большую частку тэр. займае перадгорная раўніна — Каршынскі стэп, які з ПдУ на ПнЗ перасякае даліна Кашкадар'і. На Пн і ПнУ адгор'і Зеравшанскага і Гісарскага хрыбтоў выш. да 2709 *м*; на Пд і ПдУ хр. Чакчар і адгор'і хр. Кугітантау выш. да 2170 *м*. Карысныя выкапні: гіпс, спажывная, каменная і калійная солі, сера, алебастр, азакерыт, вапнякі, газ, нафта. Клімат рэзка кантынентальны, пустынны. На раўніне сярэдняя т-ра студз. —2, ліп. 31,5 °С. Ападкаў на раўніне 200 *мм*, у гарах да 500 *мм* за год. Рака Кашкадар'я з прытокамі выкарыстоўваецца на арашэнне. Глебы на раўніне шэраземныя і саланчаковыя, на У пяскі; у гарах да 1100 *м* шэраземы, да 1500—1760 *м* цёмныя шэраземы, да 2200—3000 *м* карычневыя, вышэй горна-лугавыя. Расліннасць пустынная, у даліне Кашкадар'і тугайная, у гарах палынна-злакавая і дрэўнінна-хмызняковая. Асн. насельніцтва узбекі; жывуць таксама рускія, таджыкі, туркмены і інш. Сярэдняя шчыльн. 29,1 чал. на 1 км². Гарадскога нас. 17%. Гарады Каршы і Шахрысабз.

Асн. галіны гаспадаркі: баваўнаводства, вырошчванне збожжавых, жывёлагадоўля, садоўніцтва і вінаградарства. Прамысловасць па перапрацоўцы с.-г. сыравіны. Баваўнаачышчальныя з-ды ў Каршы, Шахрысабзе, Якабазе; грэнажны з-д у Шахрысабзе; вінаробны і кансервавы ў Кітабе; маслаэкстракцыйны, масларобчы, мясакамбінат у Каршы. Швейная ф-ка, вытворчасць буд. м. і металаапр. прадпрыемствы ў Каршы і Шахрысабзе. Старажытныя маст. промыслы: выраб цюбецеек, сюзанэ і інш. На 1.1.1971 у К. в. 70 калгасаў і 41 саўгас. 114,4 тыс. *га* зямель арашаецца. Пасяўная пл. (тыс. *га*, 1970) 468,7, у т. л. пад збожжавымі 310,0, бавоўнікам 114,2, кармавымі 33,7, агароднінна-бахчавымі 9,9. Асн. збожжавыя культуры пшаніца (201,5 тыс. *га*) і ячмень (107,1 тыс. *га*). Жывёлагадоўля каракуляводчага кірунку. На пач. 1971 (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 266,6 (у т. л. кароў 108), авечак і коз 1271,6, свіней 22,9. Шаўкаводства. Даўж. чыгунак 278 *км*. К. в. перасякае чыг. Каган — Душанбе з адгалінаваннем Каршы — Кітаб. Аўтамаб. дарог 2396 *км*, у т. л. з цвёрдым пакрыццём 1413 *км* (1969). Пед. ін-т, 10 сярэдніх спец. навуч. устаноў. Муз.-драм. тэатр. Абл. газ. «Кашкадарё хакикати» («Кашкадар'інская праўда») на узб. і рус. мовах.

Літ.: Узбекистан, М., 1967 (Советский Союз).
Р. А. Хабыеў. Ташкент.

КАШКУРЭВІЧ Арлен (Арсен) Міхайлавіч (н. 15.9.1929, Мінск), беларускі савецкі графік. У 1959 скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (педагогі В. Цвірка, П. Любамудраў), дзе выкладаў у 1959—69. Працуе ў галіне кніжнай і станковай графікі, плаката. Лепшыя работы — іл. да твораў Я. Купалы [«Тры пазмы» («Курган», «Бандароўна», «Магіла льва»), 1962; «Курган», 1967], К. Чорнага («Трэцяе пакаленне», 1966), І. Шамякіна («Сэрца на далоні», 1964). Асн. рысы творчасці К.-ілюстратара — глыбокае пранікненне ў замысел твора, уменне ствараць абагульненыя і ў той жа час своеасаблівыя па стылістыцы вобразы (іл. да «Казак» Х. К. Андэрсена, 1966). Станковыя творы К. вызначаюцца графічнай выразнасцю, добрым веданнем гістар. матэрыялу, разнастайнасцю тэхнікі.



А. М. Кашкурэвіч. Іл. да «Кургана» Я. Купалы. 1967.

Стварыў шмат графічных серый на тэмы сучаснага жыцця і працы бел. народа: «Аэрапорт» (1962) і «Наш горад» (1963), «Майстры» (1966) і інш. Барацьбе з фаш. захопнікамі прысвечана графічная серыя «Партызаны» (1969—70). У Дзярж. маст. музеі БССР 60 графічных работ мастака. Іл. гл. таксама на ўкл. да арт. *Афорт*, *Ілюстрацыя*.

В. М. Чуркіна. Мінск.

КАШО, возера ў бас. р. Усысы, левага прытока Обалі (бас. Зах. Дзвіны), у Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл. Пл. 3,69 *км*². Даўж. 6,1 *км*, найб. шыр. 1,2 *км*, сярэдняя 0,6 *км*, найб. глыб. 15,5 *м*. Катлавіна моцна выцягнута з З на У. Берагі нізкія, часткова забалочаныя. Дно ўслана аліўкавым і карычневым ілам. Вадазбор (63,7 *км*²) дробнаўгорысты. З возера выцякае р. Гаражанка (Усыса). Водзіцца плотка, верхаводка, лешч, шчупак, язь, акунь.

КАШТАН, назва дрэўных раслін двух самастойных родаў — сапраўднага К. і конскага К. Сапраўдны К. (Castanea) — род лістападных цеплалюбных дрэў сям. букавых. 14 відаў, пашыраных у Паўн. Амерыцы, Японіі, Кітаі, Міжземнамор'і. У СССР адзін від — К. ядомы, або пасяўны (C. sativa). На Беларусі расце ў дэндрарыях, моцна пашкоджваецца марозам. Драўніна ідзе на выраб мэблі і бочак. Плады ядомыя, ужываюцца ў кандытарскай прамысл. У кары дубільныя рэчывы.



Конскі каштан звычайны: *1* — галінка з лісцем і суквеццем; *2* — плод.

Дрэва выш. да 35 *м*. Лісце шырокаланцэтнае, цвёрдае, зубчастае. Кветкі дробныя, адна- або двухполыя, у прамастойных коласападобных суквеццях. Плод складаецца з 1—3 арэшкаў.

Конскі К. (Aesculus) — род дрэўных раслін сям. конскакаштанавых. 25 відаў у Паўд.-Усх. Азіі, Паўн. Амерыцы і на Балканскім п-ве. У СССР у культуры 13 відаў, на Беларусі — конскі К. звычайны (A. hippocastanum). Ім азеляняюць гарады і пасёлкі.

Дрэва выш. да 30 *м*. Лісце пальчата-складанае. Кветкі белыя, сабраныя ў прамастойныя пірамідальныя суквецці. Цвіце ў маі — чэрв. Плод — мясістая каробачка, укрытая калючкамі. Мае шмат дэкар. формаў.

Літ.: Харитонович Ф. Н. Биология и экология древесных пород, М., 1968; Галактионов И. И., Ву А. В. и Осин В. А. Декоративная дендрология, М., 1967; Интродуцированные деревья и кустарники в Белорусской ССР, Мн., 1961.

Ж. К. Пераход. Гомель.

КАШТАН (Kashtan) Уільям (н. 27.6.1909, Манрэаль), дзеяч рабочага і камуніст. руху Канады. З рабочых. З 13 гадоў пачаў прац. дзейнасць і ўключыўся ў рэвалюц. рух канадскай моладзі, з 18 гадоў удзельнічае ў камуніст. руху. У 1930—38 нац. сакратар Камуніст. лігі моладзі Канады, потым на парт. рабоце ў правінцыях Квебек і Антарыо. З 1946 сакратар Нац. камітэта партыі. З студз. 1965 ген. сакратар Кампартыі Канады (КПК). Узначальваў дэлегацыі КПК на XXIII і XXIV з'ездах КПСС, удзельнічаў у маскоўскіх Нарадах камуніст. і рабочых партый 1960 і 1969.

КАШТАНАЎКА, вёска ў Шаніўскім с/с Пружанскага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр саўгаса «Пружанскі». За 6 *км* на ПдЗ ад Пружан, 100 *км* ад Брэста, 18 *км* ад чыг. ст. Аранчыцы. 197 ж., гасп. 62 (1971). Пач. школа, магазін.

КАШТАРЫС, фінансавы дакумент для вызначэння і планавання выдаткаў і паступленняў матэрыяльна-грашовых сродкаў на прадпрыемстве, у арг-цыі ці ўстанове. Вызначае крыніцы паступленняў сродкаў і іх выкарыстанне. Зацверджаны К.— аснова фінансавання прадпрыемства, установы, арг-цыі. Складаецца на квартал, год ці на выкананне асобных работ. Садзейнічае эканоміі сродкаў, павышае кантроль за іх выдаткаваннем.

К. бываюць індывідуальныя і зводныя. Індывідуальныя ў залежнасці ад тыпу ўстановы, прадпрыемства, арг-цыі і мэты падзяляюцца на К. бюджэтных устаноў, К. выдаткаў на вытворчасць, К. буд-ва, прыходна-расходныя К. калгасаў і інш. Зводныя складаюцца па мін-вах, ведамствах, аддзелах выканкомаў Саветаў дэпутатаў працоўных праз аб'яднанне індывідуальных.

Літ.: Менчинский В. В. Составление и исполнение сметы бюджетного учреждения, М., 1955; Ефремов С. А. и Рейнин С. Н. Сметы на капитальное строительство, 2 изд., М., 1966.

С. Р. Аўсянікаў. Мінск.

КАШТОЎНАСЦЬ, філасофскае і сацыялагічнае паняцце, якое азначае, па-першае, станоўчую або адмоўную значнасць для грамадства, класа, чалавека аб'ектаў навакольнага асяроддзя (прадметныя К.), па-другое, нарматыўны, прадпісальна-ацэначны бок з'яў грамадскай свядомасці (суб'ектныя К.). З'явы грамадскай свядомасці, у якіх увасоблены інтарэсы чалавека ў ідэалаг. форме (паняцці дабра і зла, справядлівасці і несправядліва-

сці, маральныя нормы, прынцыпы, ідэалы),— суб'ектныя К. Марксісцка-ленінская філасофія адрознівае матэрыяльныя, эканам., эстэт., маральныя, прававыя, паліт., культурныя, гістар. К. Матэрыяльныя аб'екты, паколькі на іх накіраваны розны чалавечы інтарэс, з'яўляюцца рознымі К. Напр., шклянка як прылада для піцця мае спажывецкую К. (матэрыяльная даброта), як прадукт працы і прадмет таварнага абмену — эканамічную К. (вартасць). Калі шклянка — прадмет мастацтва, яна мае эстэт. К. (прыгажосць). Найвялікшая духоўная К.— ідэалы камунізма, якія выражаюць інтарэсы працоўных мас. К. суб'ектныя не толькі адлюстроўваюць з'явы, але і ацэньваюць іх, патрабуюць іх ажыццяўлення або ліквідацыі, г. зн. маюць нарматыўны характар. Змест К. падкрэслівае, што патрэбна, карысна, важна для развіцця чалавека. Ідэя дабра, напр., азначае, што «свет не задавальняе чалавека, і чалавек сваім дзеяннем вырашае змяніць яго»; дабро ў гэтым сэнсе — «патрабаванне знешняй рэчаіснасці» (Ленін У. І. Тв., т. 38, с. 200). Каштоўнасныя ўяўленні — арыенцір для чалавека, яны даюць кірунак яго дзейнасці, г. зн. маюць практ. значэнне. У класавым грамадстве К. па сваім характары класавыя. Марксізм не зводзіць да нарматыўнага боку светапоглядны, класава-партыйны характар грамадскай свядомасці. Свядомае разуменне аб'ектыўных законаў вызначае навуковасць марксісцка-ленінскага светапогляду, у той час як каштоўнасны падыход абмяжоўваецца штодзённымі практ. адносінамі і звычайнай свядомасцю. К. і ісціна ў марксізме — дзве формы абагульнення сац. вопыту і ўсведамлення законаў грамадскага быцця. Апалогіяй ідэалаг. К. капіталіст. свету з'яўляецца *аксіялогія* — ідэаліст. вучэнне пра К.

Літ.: Тугаринов В. П. О ценностях жизни и культуры, Л., 1960; яго ж. Теория ценностей в марксизме, Л., 1968; Василенко В. А. Ценность и оценка, Киев, 1964; Проблема ценности в философии, М.— Л., 1966; Дробницкий О. Г. Мир оживших предметов. Проблема ценности и марксистская философия, М., 1967; Анисимов С. Ф. Ценности реальные и мнимые, М., 1970; Антонович И. И. Американская буржуазная аксиология на службе империализма, Мн., 1967.

М. І. Бароўскі. Мінск.

КАШТОЎНЫЯ І КАЛЯРОВЫЯ ВЫРАБНЫЯ КАМЯНІ, мінералы і горныя пароды рознага хім. саставу. Падзяляюцца на ўласна каштоўныя камяні (К. к.), ці самацветы, і вырабныя камяні (В. к.). Першыя — мінералы з чыстымі тонамі афарбоўкі ці бясколерныя, празрыстыя, з высокай цвёрдасцю (цв. 6—7), з яркім бляскам, ідуць у агранку; другія — пераважна горныя пароды, у якіх прыгажосць малюнка злучаецца з гарманічнымі тонамі афарбоўкі, каляровымі ўключэннямі, часцей непразрыстыя, цв. 6—4, вязкія, здольныя паліравацца.

К. к. падзяляюцца на 3 класы: I клас — *алмаз* (агранёны — *брыльянт*), *рубін*, *сапфір*, *александрыт*, *ізумруд*, высакародная шпінель і інш.; II клас — *тапаз*, *берыл* (і яго разнавіднасці — аквамарын, вараб'явіт, геліядор), ружовы *турмалін* (рубеліт), *аметыст*, піроп, *цыркон* (гіяцынт) і інш.; III клас — *біруза*, *горны хрусталь*, *гранат*, зялёны і паліхромны турмалін, геліятроп, дыяптаз і інш. Да групы К. к. адносяць таксама мінер. ўтварэнні арган. паходжання — *жэмчуг*, *каралы*, *бурштын*. В. к. таксама падзяляюцца на 3 класы: I клас — *нефрыт*, *лазурыт*, амазаніт, *малахіт*, дымкавы кварц, *агат* і інш.; II клас — *серпенцін*, *абсідыян*, *флюарыт*, *ангідрыт* і інш.; III клас — *гіпс* (селеніт), *мармур*, *кварцыт* і інш. Падзел на класы ўмоўны, і дэфектавыя па колеры, аднароднасці і г. д. камяні II класа могуць ацэньвацца як камяні III класа, і наадварот. Многія К. к. атрымліваюць штучна.

Выкарыстоўваюцца ў ювелірнай справе, на тэхн. мэты (як абразіўны матэрыял, у дакладным прыладабудаванні, для вырабу хім. посуду і інш.), як матэрыял для мастацка-дэкаратыўных вырабаў (вазаў, шкатулак, статуэтак, пано і інш.) і як абліцовачны буд. камень. Радовішчы звязаны з шырокім комплексам геал. працэсаў, трапляюцца ў розных краінах свету, у СССР — на Урале, у Усх. Забайкаллі, на Алтаі і інш. Ілюстрацыю гл. на ўкл. да арт. *Мінералы*.

Літ.: Ферсман А. Е. Избр. тр., т. 7 — Драгоценные и цветные камни СССР, М., 1962.

І. Д. Несцяровіч. Мінск.

КАШТОЎНЫЯ ПАПЕРЫ, у капіталіст. краінах — пасведчанні пра ўдзел іх уладальнікаў у капітале прадпрыемства або пра выдачу грошай у пазыку, якія даюць права на рэгулярнае атрыманне даходу (дывідэнду, працэнта). Выпускаюцца ў выглядзе *акцый* і *аблігацый* прадпрыемстваў, аблігацый дзярж., камунальных і інш. пазык і закладных лістоў іпатэчных банкаў. Увасабляюць *фіктыўны капітал*, свабодна абарачаюцца на фондавых біржах. Не маюць вартасці, але даюць пэўны даход, таму набываюць цану, якая вагаецца ў залежнасці ад памераў даходу, нормы пазыковага працэнта і інш. прычын. Гэта служыць падставай для спекуляцыі К. п.

Выпуск К. п. дасягнуў гіганцкіх памераў пры імперыялізме ў сувязі з развіццём *акцыянерных таварыстваў* і ростам дзярж. даўгоў. Асн. маса К. п. знаходзіцца ў руках магнатаў фін. капіталу, частка — у працоўных і дробнай буржуазіі. З гэтай прычыны ўзніклі бурж. тэорыі «дэмакратызацыі капіталу», «народнага капіталізму» і інш., хоць працоўным і належыць мізэрная частка К. п. Прыцягненне дробных зберажэнняў яшчэ больш узмацняе ўладу буйнога капіталу. У СССР адзіны від К. п.— аблігацыі дзярж. пазык.

З. І. Гіяргідзе. Мінск.

КАШУБСКАЯ МОВА, адна з заходняй групы *славянскіх моў*. Мова кашубаў, якія жывуць у Пуцкім, Вейгераўскім, Картузскім і некат. гмінах Касцерскага, Слупскага, Лембаркскага, Бытаўскага пав. Кашалінскага і Гданскага ваяводстваў ПНР. На К. м. гаворыць каля 200 тыс. чал. Першыя пісьмовыя помнікі з 16 ст. Некат. мовазнаўцы лічаць яе дыялектам польскай мовы.

Асн. дыялекты: паўночнакашубскі і паўднёвакашубскі. К. м. блізкая да польскай, мае спецыфічныя асаблівасці: націск на 1-м складзе ў паўднёвакашубскім, вольны, рухомы — у паўночнакашубскім дыялектах; наяўнасць доўгіх і кароткіх галосных; частковае зберажэнне парнага ліку ў назоўнікаў, прыметнікаў і дзеясловаў; ужыванне іменных формаў прыметнікаў у атрыбутыўнай і прэдыкатыўнай функцыях і інш.

Літ.: Sychta B. Słownik gwar kaszubskich na tle kultury ludowej, t. 1—4, Wrocław, 1967—70; Atlas językowy kaszubszczyzny i dialektów sąsiednich, zesz. 1—6, Wrocław, 1964—69.

А. П. Траяноўскі. Мінск.

КАШУК Майсей Эмануілавіч [8(20).12.1899, Кішынёў — 22.9.1961], беларускі савецкі вучоны ў галіне афтальмалогіі. Д-р мед. н. (1949), праф. (1955). Чл. КПСС з 1947. Скончыў Адэскі мед. ін-т у 1925. Заг. кафедры вочных хвароб Віцебскага мед. ін-та (1945—61). Асн. працы па дыягностыцы і лячэнні вочных хвароб. Узнаг. ордэнам «Знак Пашаны», медалямі.

Тв.: Как ликвидировать трахому?, Ульяновск, 1954.

КАШЧЫНА, вёска ў Чашніцкім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Кашчынскі». За 25 *км* на ПдЗ ад Чашнікаў, 120 *км* ад Віцебска, 22 *км* ад чыг. ст. Чашнікі, звязана аўтамаб. дарогай з Лепелем і г. п. Халопенічы. 123 ж., гасп. 42 (1971). Лясніцтва, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, вет. пункт, аддз. сувязі, сталовая, 3 магазіны. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны.

КАШЧЭЕЎ Мікалай Васілевіч [н. 3(16).1. 1913, в. Кулябакі Ардатаўскага пав. Ніжагародскай губ.], дзярж. дзеяч БССР. З рабочых. Чл. КПСС з 1943. Скончыў Горкаўскі інж.-буд. ін-т (1935). Удзельнік Айч. вайны. З 1946 на гасп. рабоце ў Мінску, у 1953—55 заг. аддзела буд-ва Мінскага гаркома КПБ. З 1955 першы нам. міністра буд-ва БССР, з 1967 міністр сельскага буд-ва БССР. На XXIV—XXVI з'ездах КПБ выбраны канд. у чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета БССР 6-га і 7-га скл. Узнаг. 6 ордэнамі, медалямі.

КАШЧЭЕЎ Павел Рыгоравіч [н. 23.6(6.7). 1913, в. Малыя Татары Кацельніцкага пав. Вяцкай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1944. На фронце з 1941. Вызначыўся ў Магілёўскай вобл. 25.6.1944 узвод пад камандаваннем К. ўдзельнічаў у вызваленні в. Трылесіна Дрыбінскага р-на. Асабіста К. знішчыў кулямётную кропку праціўніка. 26.6.1944 узвод фарсіраваў Дняпро, захапіў плацдарм і замацаваўся на ім. Жыве ў Шабалінскім р-не Кіраўскай вобл.

КАШЧЭЕЎ Яўстафій Яўсеевіч [12(24).9.1898, в. Залессе Гомельскага пав. Магілёўскай губ.— 19.3.1962], удзельнік грамадз. вайны, ген.-м. (1943). З сялян. Чл. КПСС з 1918. Скончыў Ваен.-паліт. акадэмію імя Леніна (1931). У арміі з 1916, у Чырв. Арміі з жн. 1918. У 1918—22 на Зах., Паўд.-Зах., Усх. і Туркестанскім франтах. Удзельнік баёў пад Гомелем, Бабруйскам, Калінкавічамі — палітработнік. З 1923 у вайсковых часцях, рэдакцыі час. «Военный вестник», у ваен. акадэміях, Кіеўскай ваен. акрузе. У Айч. вайну на Волхаўскім, Крымскім, Паўн.-Каўказскім, Сталінградскім, Паўд., 4-м Укр., 1-м Бел. франтах. Удзельнік вызвалення Севастопаля, Растова-на-Доне, Ленінградскай бітвы, Яска-Кішынёўскай, Вісла-Одэрскай, Усх.-памеранскай аперацый, штурму Берліна. З жн. 1950 у адстаўцы. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 7 інш. ордэнамі, медалямі, ордэнам ПНР.

У. А. Пурын. Масква.

КАШЫ (Cauchy) Агюстэн Луі (21.8.1789, Парыж — 23.5.1857), французскі матэматык, чл. Парыжскай АН (1816). Выкладаў у Сарбоне. Асн. працы па алгебры, геаметрыі, тэорыі лікаў, матэм. фізіцы, оптыцы і пераважна па матэм. аналізе (тэорыя дыферэнцыяльных ураўн. і праблемы функцый комплекснага пераменнага). К. сфармуляваў адну з найб. важных агульных задач тэорыі дыферэнцыяльных ураўн. (гл. *Кашы задача*). Аўтар класічных курсаў матэматычнага аналізу.

Тв.: Рус. пер.— Краткое изложение уроков о дифференциальном и интегральном исчислении, СПб., 1831.

Літ.: Стройк Д. Я. Краткий очерк истории математики, пер. с нем., 2 изд., М., 1969.

КАШЫ ЗАДАЧА, адна з асноўных *краявых задач*; задача з пачатковымі дадзенымі. Да К. з. прыводзяць працэсы, якія характарызуюцца некат. дыферэнцыяльным законам і вызначаным пач. станам. Існаванне і адзінасць рашэння гэтай задачы ў шэрагу выпадкаў даказаў А. *Кашы*.

К. з. для дыферэнцыяльнага ўраўнення n-га парадку $y^{(n)}=f[x, y, y', \ldots, y^{(n-1)}]$ заключаецца ў адшуканні рашэння ўраўн. для пач. значэння аргумента $x=x_0$ і зададзеных пач. значэнняў $y(x_0)=y_0$, $y'(x_0)=y'_0$, ..., $y^{(n-1)}(x_0)=y_0^{(n-1)}$. Пры $n=2$ К. з. мае наступны механічны сэнс: знайсці закон руху матэрыяльнага пункта, калі зададзены рухальная сіла, пач. стан і скорасць пункта. Для сістэм звычайных дыферэнцыяльных ураўн. і ўраўн. з частковымі вытворнымі пач. дадзенымі будуць значэнні шуканай функцыі пры пач. значэнні аргумента. Важныя вынікі па рашэнні К. з. атрымалі С. В. Кавалеўская, сав. матэматыкі С. Л. Собалеў і І. Г. Пятроўскі.

Літ.: Лере Ж., Гординг Л. и Котаке Т. Задача Коши, пер. с франц., М., 1967.

Ф. Дз. Гахаў. Мінск.

КАШЫН Мікалай Іванавіч [7(20).1.1912, в. Чардома Вельскага пав. Валагодскай губ.— 30.3.1955], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1939. На фронце з 1941, маёр, парторг палка. Вызначыўся ў Дрыбінскім р-не Магілёўскай вобл. 23—24.6.1944 батальён на чале з К. адбіў танкавую контратаку праціўніка, вызваліў в. Жэвань і Чарняўку, фарсіраваў р. Басю і, акружаны праціўнікам, 14 гадзін адбіваў націск танкаў і мотапяхоты. У ліку першых пераправіўся цераз Дняпро.

КАШЫНЦАЎ Аляксей Рыгоравіч (н. 12.2. 1923, с. Жвалава Кастрамскога пав.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1944. На фронце з 1943, разведчык. Вызначыўся ў Віцебскай вобл. 24.6.1944 К. з групай разведчыкаў фарсіраваў Зах. Дзвіну каля в. Парэчча, выявіў 3 кулямётныя кропкі і скопішча варожай пяхоты, чым памог паспяхова атакаваць праціўніка. Жыве ў Валгаградзе.

КАШЫЦ Юзаф (1794—1868), удзельнік паўстання 1830—31 на Беларусі. З шляхты. У 1831 узначаліў паўстанне ў Навагрудскім і Слонімскім пав. Гродзенскай губ. У час паходу корпуса Г. Дэмбінскага з-пад Вільні ў Варшаву далучыўся да яго і перайшоў на тэр. Польшчы. Пасля разгрому паўстання ў эміграцыі (Францыя), там і памёр.

КАШЭВІЧЫ, вёска ў Лучыцкім с/с Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр калгаса імя Жданава. За 62 *км* на ПнУ ад Петрыкава, 208 *км* ад Гомеля, 45 *км* ад чыг. ст. Пціч. 923 ж., двароў 280 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, 3 магазіны. У 1941 вёску спалілі ням.-фаш. захопнікі, загубілі 37 мірных жыхароў. Помнік на брацкай магіле 51 сав. воіна Айч. вайны.

КАШЭЛЬНІКАВА Раіса Мікалаеўна [н. 3 (16).9.1904, в. Баршэўка Мазырскага пав. Мінскай губ.], беларуская савецкая актрыса. Нар. арт. БССР (1957). Пасля заканчэння Бел. драм. студыі ў Маскве (1926) у БДТ-2. З 1939 у Бел. т-ры імя Я. Купалы. У 1943 у франтавой тэатр. брыгадзе. Выконвае драм., характарныя ролі. Валодае багатымі сцэн. дадзенымі. Лірызм, драматычнасць, яркая характарнасць, гумар, тэмперамент вызначаюць мастацтва К. Ролі: Ксенія («Разлом» Б. Лаўранёва), Аксана («Гібель эскадры» А. Карнейчука), Ларыса, Глафіра, Лябёдкіна, Глумава («Беспасажніца», «Ваўкі і авечкі», «Позняе каханне», «На ўсякага мудраца хапае прастаты» А. Астроўскага), Любоў («Апошнія» М. Горкага), Надзея, Забеліна («Чалавек з ружжом», «Крамлёўскія куранты» М. Пагодзіна), Аня («Сям'я» І. Папова),





Р. М. Кашэльнікава ў ролі Паўлінкі (справа). Сцэна са спектакля.

Касагорава («Уцёкі з ночы» бр. Тур), Аўгінія («У пушчах Палесся» паводле Я. Коласа), Ізабела («Салавей» З. Бядулі), Броня («З народам» К. Крапівы), Уладзіслава Францаўна («Шчасце паэта» В. Віткі). Выдатная роля К.— Паўлінка ў аднайм. п'есе Я. Купалы. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.

Літ.: Дабралюбаў І. Яркі талент, у кн.: Майстры беларускай сцэны, Мн., 1960.

К. В. Кузняцова. Мінск.

КАШЭН (Cachin) Марсель (20.9.1869, мяст. Пемполь — 12.2.1958), дзеяч франц. і міжнар. рабочага руху, адзін з заснавальнікаў і кіраўнікоў Франц. камуніст. партыі (ФКП). З сялян. Скончыў ун-т у Бардо. У 1891—1905 чл. Рабочай партыі. У 1905—20 чл. Французскай сацыяліст. партыі, прыхільнік ле левага крыла. Удзельнік кангрэсаў 2-га Інтэрнацыянала (1904, 1907, 1912). З 1912 рэдактар, з 1918 дырэктар газ. «Юманітэ». Дэпутат парламента з 1914. У 1917 у складзе франц. парламенцкай дэлегацыі наведаў Расію, быў на Зах. фронце, у Мінску. Выступаў у абарону Сав. рэспублікі. Дэлегат ад Франц. сацыяліст. партыі на II кангрэсе Камінтэрна (1920), сустракаўся з У. І. Леніным. Паводле прапановы К. з'езд сацыяліст. партыі (1920) у Туры прыняў рашэнне пра далучэнне да 3-га Інтэрнацыянала. З 1920 чл. ЦК і Палітбюро ЦК ФКП. У 1924—43 чл. Выканкома, чл. Прэзідыума Выканкома Камінтэрна. Удзельнік IV (1922), VI (1928) і VII (1935) кангрэсаў Камінтэрна. За рэвалюц. дзейнасць няраз арыштоўваўся, быў зняволены. У 1935 стаў першым сенатарам-камуністам Францыі. З М. Тарэзам і Ж. Дзюкло ўзначальваў барацьбу ФКП за стварэнне антыфаш. нар. фронту. У 2-ю сусв. вайну актыўны ўдзельнік Руху Супраціўлення. Выбіраўся дэпутатам Устаноўчага (1945, чэрв. 1946) і Нацыянальнага сходаў (ліст. 1946, 1951 і 1956). За шматгадовую дзейнасць па ўмацаванні дружбы паміж народамі Францыі і СССР узнагароджаны ордэнам Леніна.

Літ.: Наследник парижских коммунаров, у кн.: Жизнь, отданная борьбе, М., 1964.

КАШЭЧЫЯ (Felidae), сямейства млекакормячых атр. драпежных звяроў. Пашыраны амаль на ўсёй зямлі (няма ў Антарктыдзе, Аўстраліі, на Мадагаскары). У СССР — *барс, леапард,* гепард, *рысь, тыгр, кот свойскі,* каракал, манул, лясны, стэпавы, барханны, чаротавы і далёкаўсходні каты. На Беларусі — кот свойскі, рысь.

Памеры К. розныя. Цела даўгаватае, стройнае, гнуткае. Шыя кароткая. Галава круглая з кароткаю мордай. Поўсць плямістая ці паласатая. У большасці відаў доўгі хвост. Жывуць пераважна ў лясах, часткова ў пустынях, гарах, прырочных зарасніках. Кормяцца пераважна птушкамі і млекакормячымі. Амаль усе віды прамысловыя (выкарыстоўваецца футра). Некат. шкодзяць жывёлагадоўлі і паляўнічай гаспадарцы. Гл. таксама *Леў, Ягуар,* іл. на ўкл. да арт. *Драпежныя звяры.*

Літ.: Флинт В. Е., Чугунов Ю. Д. и Смирин В. М. Млекопитающие СССР, М., 1970; Сержанин И. Н. Млекопитающие Белоруссии, 2 изд., Мн., 1961.

А. Н. Курской. Мінск.

КАЭНЗІМЫ, арган. рэчывы, *каферменты.*

КАЭРЦЫТЫЎНАЯ СІЛА (ад лац. coërcitio утрыманне), напружанасць маг. поля, неабходная для таго, каб звесці да нуля астатковую намагнічанасць у ферамагнетыках (гл. *Гістэрэзіс*). Абазначаецца H_c, выражаецца ў *а/м*. Адна з асн. характарыстык ферамагн. матэрыялаў, якія ў залежнасці ад велічыні К. с. падзяляюцца на магнітнамяккія і магнітнацвёрдыя (гл. *Магнітныя матэрыялы*).

КАЭФІЦЫЁНТ [ад лац. co(n) (cum) разам+efficiens які ўтварае], лікавы множнік у літарным выразе, вядомы множнік пры той ці іншы ступені невядомага або пастаянны множнік пры пераменнай велічыні.

Напр., К. адначлена $\frac{1}{2}ab$ ёсць $\frac{1}{2}$; $2ax$ — $2a$; у формуле даўжыні акружнасці $l = 2\pi r$ К. — 2π. Паняцце К. адносіцца і да множнікаў у розных формулах (вытворныя К., К. гаматэты, К. расшырэння, К. трэння), у дыферэнцыяльных ураўн. і інш.

КАЭФІЦЫЁНТ КАРЫСНАГА ДЗЕЯННЯ (ккдз), лікавая велічыня, якая характарызуе з энергетычнага пункту погляду дасканаласць любой сістэмы (рухавіка, машыны, жывога арганізма і г. д.) у адносінах да працэсу ператварэння ці перадачы энергіі, які адбываецца ў гэтай сістэме. Ккдз — адносіна велічыні карыснай энергіі на выхадзе сістэмы да велічыні ўсёй энергіі, якая ёю спажываецца.

Ккдз выражаецца правільным дробам (ці ў %) і заўсёды меншы за адзінку (меншы як 100%), бо частка энергіі губляецца ў сістэме на пераадоленне сіл трэння, награвание навакольнага асяроддзя і г. д. Ккдз цеплавых рухавікоў, акрамя таго, абмяжоўваецца паводле законаў тэрмадынамікі практычна дасягальнымі т-рамі награвальніка і халадзільніка. Ккдз паравых машын каля 20%, рухавікоў унутр. згарання каля 35, эл. генератараў вялікай магутнасці і трансфарматараў да 98%; ккдз працэсу фотасінтэзу 12—15%.

Б. С. Мельнікаў. Мінск.

КАЯЛОВІЧ Міхаіл Восіпавіч (20.9.1828, мяст. Кузніца Гродзенскай губ.— 23.8.1891), рускі бурж. гісторык і этнограф. Скончыў Пецярбургскую духоўную акадэмію. У 50—60-я г. настаўнік Кобрынскага духоўнага вуч. і Лідскага павятовага дваранскага вуч. З 1869 на кафедры рус. грамадзянскай гісторыі С.-Пецярбургскай духоўнай акадэміі. Аўтар гісторыка-этнагр. даследаванняў «Пра расселение плямёнаў Заходняга краю Расіі» (1863), «Пра этнаграфічны атлас заходніх губерняў» (1863), «Пра этнаграфічную мяжу паміж Заходняй Расіяй і Польшчай» (1864) і інш. Да працы «Дакументы, якія тлумачаць гісторыю Заходне-Рускага краю і яго адносіны да Расіі і Польшчы» (1865) дадаў этнагр. карту. Выступаў супраць паўстання 1863, адмаўляў за беларусамі, украінцамі і літоўцамі права на нац. самавызначэнне.

Літ.: Вандарчык В. К. Гісторыя беларускай этнаграфіі XIX ст., Мн., 1964, с. 137—140.

І. У. Саламевіч. Мінск.

КВАДРАНТ (ад лац. quadrans чацвёртая частка), 1) у матэматыцы — плоскі сектар з цэнтральным вуглом у 90°, 1/4 частка круга. К. плоскасці — любая з 4 абласцей (вуглоў), на якія плоскасць дзеліцца дзвюма ўзаемнаперпендыкулярнымі прамымі. 2) У астраноміі — старажытны вугламерны інструмент для вымярэння вышыні нябесных свяцілаў над гарызонтам і вуглавых адлегласцей паміж свяцілами. 3) У ваенавай справе — прылада для вертыкальнай наводкі гарматы паводле зададзенага вугла ўзвышэння.

КВАДРАНТЫДЫ, рой метэорных часцінак, радыянт якіх знаходзіцца на мяжы сузор'яў Валасаса і Дракона. Гл. таксама *Метэорныя патокі.*

КВАДРАТ (ад лац. quadratus чатырохвугольны), 1) *прамавугольнік* з роўнымі старанамі. 2) К. ліку a — здабытак $a \cdot a = a^2$, назва звязана з такім жа выразам плошчы К. (як геам. фігуры) са стараной a.

«КВАДРАТ ЛАГІЧНЫ», наглядная схема, якая паказвае адносіны ісціннасці і няісцінасці паміж агульнасцвярджальным *(A)*, агульнаадмоўным *(E)*, прыватнасцвярджальным *(I)*, прыватнаадмоўным *(O)* катэгарычнымі суджэннямі.



Прапанаваны ў 11 ст. візант. логікам Міхаілам Пселам. Кожная лінія на «К. л.» паказвае пэўныя адносіны паміж двума відамі суджэнняў. Напр., суджэнні A і O, E і I — супярэчныя; суджэнні A і I, E і O знаходзяцца ў адносінах падпарадкавання; суджэнні A і E — процілеглыя, I і O — падпроцілеглыя. У «К. л.» маюцца на ўвазе неакрэсленыя прыватныя суджэнні, якія выражаюцца формулай: «Прынамсі некаторыя S ёсць P». Характар адносін паміж гэтымі суджэннямі заканамерна вызначае ісціннасць або няісцінасць адпаведнай пары суджэнняў, а таксама адносіны ле да ўсіх астатніх. Таму, ведаючы значэнне любога з іх, можна вызначыць ісціннасць або няісцінасць усіх астатніх. Каб атрымаць правільны вывад з суджэнняў, якія параўноўваюцца, акрамя правілаў сувязі суджэнняў трэба ведаць, што ісціннасць вываду залежыць і ад дакладнасці лагічнага сэнсу кожнага суджэння.

Літ.: Асмус В. Ф. Логика, М., 1947, с. 143—146; Кондаков Н. И. Логический словарь, М., 1971, с. 274—275.

А. С. Каляўчэня. Мінск.

КВАДРАТНАЕ ЎРАЎНЕННЕ, алгебраічнае ўраўненне 2-й ступені $ax^2+bx+c=0$, дзе a, b, c — каэфіцыенты ўраўн.

К. ў. мае два карані, якія знаходзяцца паводле формул: $x_1 = \frac{-b+\sqrt{b^2-4ac}}{2a}$, $x_2 = \frac{-b-\sqrt{b^2-4ac}}{2a}$.

Выраз $D = b^2 - 4ac$ наз. дыскрымінантам К. ў. Характар каранёў ураўн. з сапраўднымі каэфіцыентамі вызначаецца знакам дыскрымінанта: $D > 0$ — карані сапраўдныя і розныя, $D < 0$ — спалучана комплексныя, $D = 0$ — сапраўдныя і роўныя $\left(x_1 = x_2 = -\frac{b}{2a}\right)$. Калі разглядаць выраз ax^2+bx+c як функцыю y пераменнага x, то гэты выраз наз. квадратным трохчленам і графічна паказваецца *парабалай.*

КВАДРАТУРА КРУГА, задача пра дакладную пабудову квадрата, роўнавялікага (плошчаю) зададзенаму кругу. Пад К. к. разумеюць таксама задачу вылічэння плошчы круга з пэўным прыбліжэннем.

Яшчэ матэматыкі Ст. Грэцыі спрабавалі рашыць задачу пра дакладную К. к. з дапамогай цыркуля і лінейкі. Толькі ў канцы 19 ст. было даказана, што яна не вырашальная з дапамогай цыркуля і лінейкі (нельга пабудаваць адрэзак $x = \sqrt{\pi r^2}$, таму што лік π трансцэндэнтны). Існуюць прыбліжаныя і механічныя спосабы рашэння К. к.

Літ.: О квадратуре круга (Архимед, Гюйгенс, Ламберт, Лежандр), пер. с нем., М.— Л., 1934; Архимед. Соч., пер. с греч., М., 1962.

А. С. Фядзенка. Мінск.

КВАДРАТЫЧНАЕ АДХІЛЕННЕ (у матэматыцы), мера рассейвання выпадковай велічыні, роўная квадратнаму кораню з *дысперсіі.*

КВАДРАТЫЧНАЯ ФОРМА, аднародны мнагачлен $f(x)$ 2-й ступені ад n пераменных: $f(x) = \sum_{i,j=1}^{n} a_{ij} x_i x_j$, дзе a_{ij} — лікі. Напр., для

$n=2$ К. ф. мае від $f(x)=a_{11}x_1^2+(a_{12}+a_{21})\times$ $\times x_1x_2+a_{22}x_2^2$. Тэорыя К. ф. цесна звязана з тэорыяй паверхняў другога парадку: шырокі клас такіх паверхняў (цэнтральныя паверхні) задаецца ўраўненнямі $f(x)=D$, дзе D — сапраўдны лік.

Любая К. ф. адпаведнай лінейнай заменай пераменных $x_i=b_{i1}y_1+\ldots+b_{in}y_n, \ldots, x_n=b_{n1}y_1+\ldots+b_{nn}y_n$, дзе b_{ij} — лікі, прыводзіцца да простага віду: пасля прывядзення падобных членаў астануцца толькі члены з квадратамі новых пераменных (кананічны від К. ф.). Рознымі спосабамі можна прывесці К. ф. да сумы квадратаў, але іх колькасць (ранг К. ф.) заўсёды будзе адна і тая ж. Кожнай К. ф. можна паставіць у адпаведнасць геам. сістэму з n-мернай прасторы. Напр., з К. ф. $x_1^2+\ldots+x^2n$ звязваецца звычайная еўклідава геаметрыя, з К. ф. $x_1^2+x_2^2+$ $+x_3^2-c^2x_4^2$ — геаметрыя Мінкоўскага, якая, калі c — скорасць святла, з'яўляецца матэм. асновай спецыяльнай тэорыі адноснасці Эйнштэйна. Тэорыя К. ф. выкарыстоўваецца таксама пры даследаванні на экстрэмум функцый некалькіх пераменных, у тэорыі ўстойлівасці руху і інш.

Літ.: Ефимов Н. В. Квадратичные формы и матрицы, 4 изд., М., 1967; Мальцев А. И. Основы линейной алгебры, 3 изд., М., 1970.

У. С. Конюх. Мінск.

КВАДРУПОЛЬ (ад лац. quadrum чатырохвугольнік+*полюс*), сістэма 4 эл. зарадаў, якая складаецца з 2 дыполяў, электрычныя моманты якіх роўныя па велічыні і процілеглыя па кірунку. Патэнцыял К. на вялікіх адлегласцях R зменьваецца як $1/R^3$. Пры змене велічыні зарадаў ці адлегласці паміж імі К. выпрамяняе эл.-магн. хвалі (гл. таксама *Дыполь, Момант электрычны, Выпрамяненне*).

КВАЗАРЫ (скарач. ад Quasi-Stellar Radio Sources квазізоркавыя радыёкрыніцы), зоркападобныя крыніцы касмічнага выпрамянення, спектральныя лініі якіх маюць вялікія *чырвоныя зрушэнні*. Калі чырвонае зрушэнне К. абумоўлена іх касмалагічным расшырэннем (гл. *Метагалактыка*), то многія К.— найбольш аддаленыя з вядомых аб'ектаў Сусвету [магутнасць выпрамянення ў інфрачырвоным і субміліметровым дыяпазоне да 10^{41} *вт*, адлегласць парадку некалькіх млрд. *св. г.* (светлавых гадоў)]. Выпрамяненне К. выказвае значную пераменнасць з характэрным часам ад некалькіх гадоў да некалькіх дзён, што сведчыць пра малыя памеры ядраў К. (парадку 10^{-2} *св. г.*) у параўнанні са звычайнымі галактыкамі (каля 10^5 *св. г.*). Уласцівая выпрамяненню К. палярызацыя інфрачырвоных і радыёхваляў азначае важнасць для К. сінхратроннага механізма выпрамянення. Працэсы ў К. выяўляюць падобнасць да з'яў у *радыёгалактыках* і ў актыўных ядрах інш. тыпаў галактык.

Закончанай тэорыі К. да гэтага часу няма. Магчыма, што крыніцай магутнага пераменнага выпрамянення К. з'яўляецца звышмасіўная магніта-плазмавая канфігурацыя, якая круціцца,— магнітоід. У працэсе павольнага гравітацыйнага сціскання магнітоіда энергія яго ўнутр. рухаў і магнітнага поля ператвараецца ў энергію *касмічных прамянёў*, эл.-магн. выпрамянення і кінетычную энергію газавых выкідаў. З далейшым вывучэннем К. звязваюцца спадзяванні на больш глыбокае разуменне ранніх этапаў эвалюцыі Сусвету, стварэння ў ім галактык розных тыпаў, у тым ліку і К.

Літ.: Зельдович Я. Б. и Новиков И. Д. Релятивистская астрофизика, М., 1967; Бербидж Дж. и Бербидж М. Квазары, [пер. с англ.], М., 1969.

Л. М. Азарной. Масква.

КВАЗІ ... (лац. quasi як быццам, амаль, уяўны), частка складаных слоў. Напр., *квазіоптыка*, квазіпругкая сіла, квазінавуковы.

КВАЗІОПТЫКА (*квазі...*+*оптыка*), раздзел фізікі, які вывучае хвалевыя працэсы з даўжынёй хвалі намнога меншай, чым характэрныя для дадзенай задачы памеры.

Гэтыя працэсы ўключаюць з'явы распаўсюджвання, дыфракцыі і выпрамянення хваляў. К. выкарыстоўвае ўяўленні *геаметрычнай оптыкі*, аднак істотнае значэнне мае ўлік хвалевай прыроды з'яў. Метады тэарэт. даследавання ў К. ўмоўна падзяляюць на 2 групы. У адной з іх выходныя дакладныя ўраўненні заменьваюцца прыблізнымі і шукаюцца рашэнні гэтых ураўненняў. У другой адразу ў агульным выглядзе выкарыстоўваюцца раскладанні рашэнняў па элементарных хвалях, пасля чаго ўжываюцца прыблізныя метады даследавання. К. пачала хутка развівацца ў 50—60-я г. 20 ст. з асваеннем міліметровага і субміліметровага дыяпазонаў эл.-магн. хваляў і са стварэннем аптычных *квантавых генератараў*, выпрамяненне якіх само стала аб'ектам вывучэння К.

Літ.: Квазиоптика. Избр. доклады на международном симпозиуме, пер. с англ. и нем., М., 1966.

М. А. Гусак. Мінск.

КВАЗІЧАСЦІНКІ, элементарныя ўзбуджэнні, з дапамогай якіх у *статыстычнай фізіцы* апісваюць станы вадкасцей і цвёрдых целаў. Маюць цэлы або паўцэлы *спін*. Прыклады К.: кванты гукавых ваганняў крышталічнай рашоткі (фанопы) і кванты спінавых хваляў у ферамагнетыках (магноны).

Паняцце К. ўзнікае ў сувязі з квантавамеханічным апісаннем калектыўнага руху атамаў у рэчыве. Таму К. нельга атаясамліваць з рэальнымі часцінкамі. Аднак К. можна ўяўляць як часцінкі, што рухаюцца ў целе і маюць пэўныя энергіі, імпульсы і спіны. Пры вельмі нізкіх т-рах узбуджаныя станы цела апісваюцца невялікім лікам устойлівых К., якія слаба ўзаемадзейнічаюць паміж сабою (іх агульная энергія роўная суме энергій асобных К.). Таму сукупнасць такіх К. можа разглядацца як ідэальны газ. Паводзіны гэтага газу вызначаюцца законамі *квантавай статыстыкі*.

Л. І. Камароў. Мінск.

КВАКВА (Nycticorax nycticorax), птушка сям. чаплевых атр. галянастых. Пашырана ў Паўд. Еўропе і Азіі, у Афрыцы (акрамя Сахары), Паўднёвай і Паўночнай Амерыцы. У СССР трапляецца на Пд Рускай раўніны і ў Сярэдняй Азіі. На Беларусі залётная птушка.

Даўж. цела К. каля 60 см. Мае кароткія ногі, ярка-чырвоныя вочы, на патыліцы чубок з 3—6 доўгіх пёраў. Селіцца сярод забалочаных лясоў, вараснікаў трыснягу, лазнякоў. Начная птушка. Нясе 4—5 яец. Корміцца рыбаю, жабамі, водным беспазваночнымі.

Літ.: Птицы Советского Союза, т. 3, М., 1951; Федюшин А. В. и Долбик М. С. Птицы Белоруссии. Мн., 1967 (бібліягр.).

КВАКЕРЫ (ад англ. quakers тыя, што трасуцца), члены рэлігійна-хрысціянскіх абшчын, засн. у сярэдзіне 17 ст. ў Англіі Дж. Фоксам. Прапаведуюць усеагульнае братэрства, пацыфізм і антымілітарызм, адмаўляюць інстытут свяшчэннікаў, царк. абрады, ваен. павіннасць.

У 2-й пал. 17 ст., ратуючыся ад праследавання англіканскай царквы і ўрада, многія К. эмігравалі ў Паўн. Амерыку. У 20 ст. паявіліся і ў інш. краінах. За дапамогу насельніцтву, якое пацярпела ад вайны, і абарону міру арганізацыі К. «Кала мітэт службы амер. сяброў» і «Савет службы сяброў Англіі» ў 1947 узнагароджаны Нобелеўскай прэміяй міру. Большасць К. жыве ў ЗША (127,5 тыс. чал.), Вялікабрытаніі (21,6 тыс.).

КВАКШЫ (Hylidae), сямейства атр. *бясхвостых земнаводных*. 416 відаў, пашыраных амаль ва ўсім свеце, акрамя трапічнай Азіі, Афрыкі, Антарктыды і Арктыкі. Асабліва шматлікія К. ў Паўд. Амерыцы і ў Аўстраліі. У СССР 2 віды: К. далёкаўсходняя (Hyla japonica) і К. звычайная (H. arborea), пашыраная на ПдЗ Еўрапейскай часткі СССР, на Беларусі — у паўднёва-заходніх раёнах.

Цела К. зеленаватага, шэрага або цёмна-жоўтага колеру, даўж. 1,7—13,5 см. У самцоў на гарляку пад скурай галасавы мяшок. Большасць відаў маюць на канцах пальцаў дыскападобныя залозістыя прысоскі (прысоскі). Жывуць К. пераважна на дрэвах, размнажаюцца ў вадзе. Зімуюць пайчасцей у глеі на дне вадаёмаў. Корміцца насякомымі. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Земнаводныя*.

КВАЛІФІКАЦЫЯ (лац. qualitas якасць+facio раблю), 1) узровень падрыхтаванасці чалавека да пэўнага віду дзейнасці. Характарызуецца сукупнасцю ведаў і вытворчых навыкаў, неабходных для выканання адпаведных работ. Павышэнне К.— адна з гал. умоў росту прадукцыйнасці працы, развіцця вытворчасці на аснове навук.-тэхн. прагрэсу. У сацыяліст. грамадстве павышэнне К. садзейнічае пераадоленню розніцы паміж фіз. і разумовай працай, устанаўленню сац. роўнасці, росту дабрабыту народа. К. кіраўніцкіх кадраў У. І. Ленін лічыў неабходнай умовай навук. арганізацыі кіравання вытворчасцю. З развіццём прадукцыйных сіл патрэба ў кваліфікаваных кадрах расце. У БССР (1971) ВНУ і тэхнікумы рыхтуюць спецыялістаў 350 спецыяльнасцей. У 1971—75 у рэспубліцы намечана падрыхтаваць 120 тыс. спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй (у 1,5 раза больш, чым у 1966—70) і 180 тыс. з сярэдняй адукацыяй (у 1,2 раза больш, чым у 1966—70). Пашыраецца і сістэма *прафесійна-тэхнічнай адукацыі, вытворча-тэхнічнага навучання*. 2) Характарыстыка, ацэнка прыдатнасці каго-небудзь да той ці інш. дзейнасці. Гл. таксама *Кадры*.

Літ.: Жамин В. А. и Еглазарян Г. А. Эффективность квалифицированного труда, М., 1963; Батышев С. Я. Формирование квалифицированных рабочих кадров в СССР, М., 1971.

А. В. Духаніна. Мінск.

КВАЛІФІКАЦЫЯ ЗЛАЧЫНСТВА, вызначэнне пэўнай адпаведнасці адзнак вароблена злачынства, які прадугледжаны крымінальным законам. Юрыд. ацэнка дзеяння саставу пэўнага злачынства — аснова вызначэння меры пакарання.

Правільная К. з.— найважнейшае патрабаванне сацыяліст. законнасці ў час правядзення дазнання, папярэдняга следства і пры судовым разглядзе крымін. справы. Канчаткова вырашае пытанне пра ўчыненне сацыяліст. законнасці ў час правядзення дазнання, папярэдняга следства і пры судовым разглядзе К. з. суд. Памылкі пры К. з. разглядаюцца як парушэнне сацыяліст. законнасці і з'яўляюцца падставаю для скасавання ці змены прыгавору.

Літ.: Кудрявцев В. Н. Теоретические основы квалификации преступлений, М., 1933.

КВАНТ ДЗЕЯННЯ, гл. *Планка пастаянная*.

КВАНТ СВЯТЛА, тое, што *фатон*.

КВАНТ ЭНЕРГІІ (ад лац. quantum колькі), пэўная колькасць энергіі, якую можа паглынуць ці аддаць мікрасістэма (ядро, атам, малекула) у элементарным акце ўзаемадзеяння. Гл. таксама *Квантаванне, Квантавая механіка*.

КВАНТАВА́ННЕ, выдзяленне дыскрэтнай сукупнасці з мноства неперарыўных значэнняў фізічнай велічыні. Адпавядае заканамернасцям мікрасвету, дзе для некат. фіз. характарыстык існуе толькі пэўны шэраг асобных магчымых значэнняў (гл. *Момант колькасці руху, Узроўні энергіі*).

К. ўведзена ў фізіку М. Планкам (1900), які выказаў меркаванне, што асцылятар з частатой ваганняў ν можа вылучаць энергію толькі порцыямі $\varepsilon=h\nu$, дзе h — *Планка пастаянная*. Дастасаванне гэтых суадносін да планетарнай мадэлі атама разам з патрабаваннем $M_z=mh/2\pi$ (M_z — праекцыя моманту колькасці руху, $m=\pm1, \pm2, \ldots$) прывяло да К. круговых атамных арбіт (Н. Бор, 1913). А. Зомерфельд (1915) абагуліў умовы К. на больш складаныя выпадкі, што дазволіла распрацаваць метады разліку *атамных спектраў*. Да стварэння *квантавай механікі* К. мела характар некат. спец. правілаў. У квантавай механіцы К. ўзнікае як непасрэдны вынік агульных матэм. патрабаванняў, якім падпарадкоўваюцца не ўраўненні. Напр., *Шродынгера ўраўненне* для электрона ў атаме вадароду мае выгляд $(\hat{p}^2/2\mu-e^2/r)\psi=E\psi$, дзе $\hat{p}$ — аператар імпульсу, μ — прыведзеная маса, e^2/r — аператар энергіі ўзаемадзеяння электрона з ядром, E і ψ — энергія і хвалевая функцыя электрона. Функцыі ψ нароўныя 0 толькі пры $E_n=\dfrac{Ry}{n^2}$, дзе Ry — *Рыдберга пастаянная*, $n=1, 2, \ldots$ — т. зв. галоўны квантавы лік. Т. ч., для электрона ў атаме магчымыя толькі некат. дыскрэтныя ўзроўні энергіі. Пад К. разумеюць таксама працэдуру замены суадносін паміж класічнымі фіз. велічынямі на суадносіны паміж адпаведнымі аператарамі.

Літ.: Шпольский Э. В. Атомная физика, т. 1, 5 изд., М., 1963; Борн М. Атомная физика, пер. с англ., 3 изд., М., 1970.

Л. М. Тамільчык. Мінск.

КВАНТАВАЯ МЕХАНІКА, тэорыя механічных працэсаў з удзелам мікрачасцінак. Усім мікрааб'ектам характэрна своеасаблівая двоеснасць: у залежнасці ад эксперым. умоў яны могуць паводзіць сябе як часцінкі ці як хвалі. Напр., дастаткова кароткія эл.-магн. хвалі ўзаемадзейнічаюць з асобнымі электронамі так, як быццам з'яўляюцца патокам часцінак (гл. *Фатон, Фотаэфект, Комптана з'ява*). У патоку ж электронаў, які адбіваецца павярхняй крышталю, назіраецца чаргаванне максімумаў і мінімумаў інтэнсіўнасці, характэрнае *інтэрферэнцыі хваляў* (гл. таксама *Дыфракцыя часцінак*). Наогул выяўляецца, што мікрачасцінкі рухаюцца ў прасторы па законах распаўсюджвання хваляў, а пры ўзаемных сутыкненнях абменьваюцца энергіяй і колькасцю руху (імпульсам) як звычайныя часцінкі. Таму тэарэт. апісанне мікраскапічных з'яў патрабуе аб'яднання ўзаемна несумяшчальных фізічных характарыстык, чаго нельга ажыццявіць у межах класіч. фізікі ўнутрана несупярэчлівым спосабам (гл. *Дапаўняльнасці прынцып*). Квантавая тэорыя зыходзіць з таго, што дакладнае вызначэнне асн. фіз. велічынь звязана з канечнасцю ($h\neq0$) кванта дзеяння. Пры гэтым аказваецца немагчымым адначасовае выкарыстанне некаторых фіз. велічынь, перш за ўсё — каардынат і імпульсу часцінкі. Таму для мікрачасцінак не мае сэнсу, напр., такое паняцце, як рух уздоўж траекторыі; усе тэарэт. сцвярджэнні адносна вынікаў тых ці іншых узаемадзеянняў маюць імавернасны характар.

К. м. ўзнікла як развіццё ўлўлення́ў М. Планка (1900) і А. Эйнштэйна (1905, 1916) пра карпускулярныя ўласцівасці святла (гл. *Планка закон выпрамянення*), напаўкласічнай мадэлі атама Н. Бора (1913), ідэі Л. дэ Бройля адносна хвалевых уласцівасцей мікрачасцінак (гл. *Хвалі дэ Бройля*). Фундаментальнае развіццё К. м. атрымала ў працах В. Гейзенберга (1925), Э. Шродынгера і П. А. М. Дзірака (1926). Паводле К. м. ўсю інфармацыю пра фіз. стан мікрасістэмы змяшчае ў сабе *хвалевая функцыя*. Яна вызначае размеркаванне імавернасці для розных фіз. велічынь, якія характарызуюць сістэму (становішча ў прасторы, імпульс, энергія і г. д.). Кожнай класічнай фіз. велічыні ў К. м. адпавядае пэўны аператар, уласныя лікі якога супадаюць з навіральнымі значэннямі фіз. велічыні. Магчымыя станы сістэмы апісваюцца адпаведнымі ўласнымі функцыямі. У залежнасці ад таго, дыскрэтную ці неперарыўную паслядоўнасць утвараюць уласныя лікі аператара, адпаведная фіз. велічыня з'ўляецца квантаванай ці неквантаванай (гл. *Квантаванне*). Калі аператары 2 фіз. велічынь (L і M) не камутуюць, г. зн. што вынік дзеяння аператараў L і M на хвалевую функцыю ψ залежыць ад парадку іх дзеяння ($\hat{L}\hat{M}\psi \neq \hat{M}\hat{L}\psi$), то рэалізацыя такіх станаў мікрасістэмы, у якіх адпаведныя фіз. велічыні адначасова мелі б пэўнае значэнне, немагчыма; перш-наперш гэта датычыць аператараў каардынат і імпульсу (гл. *Неазначальнасцей суадносіны*). Камутатыўнасць аператараў пэўных фіз. велічынь з аператарам энергіі азначае, што гэтыя фіз. велічыні не зменьваюцца з цягам часу, г. зн. з'ўляюцца інтэграламі руху. Асн. інтэграл руху ў К. м.— энергія. Каб дакладна вызначыць стан мікрасістэмы, неабходна ведаць энергію і іншыя ўзаемна камутатыўныя інтэгралы руху, якімі, напр. для часцінкі ў полі цэнтр. сіл, з'ўляюцца квадрат моманту імпульсу і адна з яго праекцый. Калі інтэгралы руху маюць дыскрэтны спектр, стан сістэмы вызначаецца з дапамогай квантавых лікаў.

Прадказанні К. м. пераходзяць у адпаведныя вынікі класіч. механікі, калі для фіз. сістэмы ўсе велічыні размернасці дзеяння становяцца значна большымі, чым Планка пастаянная h (гл. *Адпаведнасці прынцып*). Абагульненне асн. ідэй К. м. на выпадак, калі энергія руху часцінак параўнальная з энергіяй спакою (гл. *Адноснасці тэорыя*), дало магчымасць прадказаць існаванне антычасцінак, стварыць тэорыю ўласнага моманту колькасці руху (гл. *Спін*) і інш. Паколькі К. м. з'яўляецца механічнай тэорыяй, яна не можа паслядоўна разглядаць працэсы паглынання святла і эл.-маги. выпрамянення. Аднак яна дае набліжаныя метады разліку, дастатковыя для патрэб атамнай і часткова ядз. фізікі. Паслядоўную тэорыю ўзаемадзеяння фатонаў з электрычна зараджанымі часцінкамі дае *квантавая электрадынаміка*. Ураўненні К. м. даюць магчымасць дакладна вылічыць магчымыя *ўзроўні энергіі* (гл. *Тродынгера ўраўненне*) мікрасістэмы, а таксама імавернасць пераходаў паміж імі. К. м. з'яўляецца тэарэт. асновай сучаснай атамнай і ядз. фізікі. Некат. сцвярджэнні К. м. шматразова выкарыстоўваліся для ідэаліст. спекуляцый. Аднак у сапраўднасці асн. прынцыпы К. м. знаходзяцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі матэрыялізм. дыялектыкі. Пытанні К. м. падрабязна асвятляюцца з моманту яе ўзнікнення час. «Успехи физических наук», які выдаецца ў Маскве. Гл. таксама *Квантавая тэорыя поля, Абменнае ўзаемадзеянне*.

Літ.: Блохинцев Д. И. Основы квантовой механики, 4 изд., М., 1963; Давыдов А. С. Квантовая механика, М., 1963; Фейнман Р., Лейтон Р. и Сэндс М. Фейнмановские лекции по физике, в. 8—9, пер. с англ., М., 1966—67; Бом Д. Квантовая теория, пер. с англ., 2 изд., М., 1965; Теоретическая физика 20 века, [пер.], М., 1962.

Л. М. Тамільчык. Мінск.

КВАНТАВАЯ СТАТЫСТЫКА, раздзел *статыстычнай фізікі*, у якім вывучаюцца ўласцівасці сістэм тоесных мікрачасцінак. З *квантавай механікі* вынікае, што энергія сістэмы мікрачасцінак мае дыскрэтныя значэнні, а хвалевыя функцыі, якія апісваюць розныя станы сістэмы тоесных часцінак, сіметрычныя або антысіметрычныя адносна перастановак часцінак. Калі хвалевая функцыя сіметрычная, то ў адным і тым жа квантавым стане можа знаходзіцца адвольны лік часцінак (статыстыка Базэ — Эйнштэйна); калі антысіметрычная, то не больш як адна часцінка (статыстыка Фермі — Дзірака). В. Паўлі метадамі квантавай тэорыі поля даказаў, што тып К. с. адназначна звязаны са спінам: часцінкі з цэлым (0, 1, 2, ..., у адзінках $\hbar = 1{,}05 \cdot 10^{-34}$ *дж · сек*) спінам падпарадкоўваюцца К. с. Базэ — Эйнштэйна, часцінкі з паўцэлым ($^1/_2$, $^3/_2$, ...) — К. с. Фермі — Дзірака. Таму *фатон*, *альфа-часцінкі*, ядры з цотным лікам нуклонаў наз. базонамі, а *электрон*, *нейтрына*, *пратон*, ядры з нецотным лікам нуклонаў — ферміёнамі.

У статыстычнай раўнаважнасці пры адсутнасці ўзаемадзеяння сярэдні лік n_i часцінак у стане i з энергіяй E_i вызначаецца формулай: $n_i = [e^{(E_i-\mu)/kT} \pm 1]^{-1}$, дзе μ — *хімічны патэнцыял* сістэмы, $k = 1{,}38 \times 10^{-23}$ *дж/град* — пастаянная Больцмана, T — абсалютная т-ра. Знак «+» датычыць ферміёнаў, знак «−» — базонаў. Пры вял. т-рах квантавыя эфекты становяцца неістотнымі, і формула для n_i (пры адсутнасці знешняга поля) пераходзіць у класічнае *Максвела размеркаванне*. Пры досыць нізкіх т-рах ($T \to 0$) для ферміённага газу n_i блізкае да 0 для ўсіх $E_i > \mu$ і амаль 1 для ўсіх $E_i < \mu$. Таму амаль усе ніжнія станы аказваюцца запоўненымі (выраджаны Фермі-газ). Для Базэ-газу выраджэнне заключаецца ў тым, што ўсе яго часцінкі пры $T \to 0$ імкнуцца перайсці ў стан з нулявым імпульсам (Базэ — Эйнштэйна кандэнсацыя). З дапамогаю К. с. стала магчымым тлумачыць многія фіз. з'явы, якія з пункту погляду класічнай фізікі нельга было тлумачыць: *Планка закон выпрамянення* абсалютна чорнага цела, *электраправоднасць*, *цеплаёмістасць* цвёрдых цел, *звышцякучасць*, *звышправоднасць* і інш.

Літ.: Ландау Л. Д. и Лифшиц Е. М. Статистическая физика, 2 изд., М., 1964; Майер Д. и Гепперт-Майер М. Статистическая механика, пер. с англ., М., 1952; Пайнс Д. и Нозьер Ф. Теория квантовых жидкостей, пер. с англ., М., 1967.

Л. І. Камароў. Мінск.

КВАНТАВАЯ ТЭОРЫЯ ПОЛЯ, рэлятывісцкая квантавая тэорыя *элементарных часцінак* і іх узаемадзеянняў. Адзін з самых фундаментальных раздзелаў сучаснай тэарэт. фізікі, у якім вывучаюцца найб. глыбокія і агульныя фіз. заканамернасці. К. т. п. разглядае ў адзінстве ўласцівасці часцінак і палёў, прасторы і часу. *Квантавая электрадынаміка* з'явілася першай К. т. п. фатонаў і электронаў — квантаў электрамагнітнага і электроннага палёў. Потым ідэі і метады квантавай электрадынамікі былі пашыраны на *мезоны*, *нуклоны* і інш. часцінкі. У К. т. п. кожнаму тыпу часцінак адпавядае поле, якое апісваецца аператарнай хвалевай функцыяй ψ. Кампаненты ψ пры змене каардынат прасторы-часу пераўтвараюцца паводле прадстаўленняў групы Лорэнца (гл. *Адноснасці тэорыя*). Функцыі свабодных палёў ψ_0 раскладаюцца на плоскія хвалі, якія апісваюць станы з вызначанай энергіяй і імпульсам: $\psi_0 = \sum_n \left(C_n e^{ikx} + C_n^+ e^{-ikx}\right)$, дзе k — 4-мерны вектар энергіі-імпульсу часцінкі, x — яе вектар каардынатаў-часу, C_n і C_n^+ — аператары паглынання і выпрамянення часцінак у нейкім n-м стане. Аператары C_n і C_n^+ задавальняюць перастановачным суадносінам $C_n C_{n'}^+ \mp C_{n'}^+ C_n = \delta_{nn'}$ ($\delta_{nn} = 1$; $\delta_{nn'} = 0$, калі $n \neq n'$), прычым верхні (ніжні) знак адпавядае часцінкам цэлага (паўцэлага) спіну, якія, паводле тэарэмы Паўлі, падпарадкоўваюцца *квантавай статыстыцы* Базэ — Эйнштэйна (Фермі — Дзірака). У К. т. п. кожнай часцінцы адпавядае сваё *антычасцінка*. Гэты вывад з тэорыі пацверджаны адкрыццём пазітронаў (1932), а пазней антыпратонаў, антынейтронаў і інш. антычасцінак.

У К. т. п. няма закону захавання ліку часцінак: пры ўзаемадзеянні яны могуць пераўтварацца адны ў другія. Узаемадзеянне ўлічваецца членамі выняшага за першы парадку адносна хвалевых функцый узаемадзейных палёў. Гэтыя члены ўраўнення поля і самі ўраўненні павінны задавальняць патрабаванням асноўных фіз. патрабаванняў: рэлятывісцкай каварыянтнасці, унітарнасці, інварыянтнасці адносна пераўтварэнняў C (перастаноўка часцінак і антычасцінак), P і T (інверсія прасторы-часу) і інш. Толькі ў квантавай электрадынаміцы, дзякуючы малой канстанце ўзаемадзеяння, метад узбурэння дае задавальняючыя колькасныя вынікі ўжо ў першым парадку. У выпадку неэлектрамагнітных узаемадзеянняў К. т. п. часта вымушана абмяжоўвацца якаснымі вывадамі. У К. т. п., як і ў квантавай электрадынаміцы, істотную ролю адыгрываюць: метад S-матрыцы, дыяграмы Фейнмана, паняцце вакууму. У апошні час вял. ўвага надаецца вывучэнню аксіяматычнай К. т. п. і аналітычных уласцівасцей S-матрыцы з дапамогай інтэгральных (дысперсійных) суадносін, якія звязваюць амплітуды імавернасцей пераходу з аднаго стану ў другі. Развіваюцца і інш. кірункі: нелакальная К. т. п., індэфінітная метрыка, квантаванне прасторы і часу, адзіная нелінейная тэорыя поля. Метады К. т. п. шырока ўжываюцца ў многіх раздзелах фізікі: тэорыі цвёрдага цела, тэорыі многіх целаў і інш.

Літ.: Боголюбов Н. Н. и Ширков Д. В. Введение в теорию квантованных полей, М., 1957; Боголюбов Н. Н., Логунов А. А. и Тодоров И. Т. Основы аксиоматического подхода в квантовой теории поля, М., 1969; Федоров Ф. И. Проективные операторы в теории элементарных частиц. «Журнал экспериментальной и теоретической физики», 1958, т. 35, в. 2; Швебер С. Введение в релятивистскую квантовую теорию поля, [пер. с англ.], М., 1963.

Ф. І. Фёдараў. Мінск.

КВАНТАВАЯ ХІМІЯ, раздзел тэарэтычнай хіміі, у якім хімічныя з'явы вывучаюцца на аснове ўлўленняў *квантавай механікі*. Распрацоўвае метады апісання і разліку электронных абалонак малекул, разглядае сувязь паміж будовай і іх уласцівасцямі. У К. х. высветлена прырода хім. сувязі, тэарэтычна абгрунтавана перыяд. сістэма Мендзялеева, створана тэорыя хім. рэакцый.

Развіццё К. х. пачалося ў 20—30-я г. 20 ст. з прац па вывучэнні будовы малекул і прыроды хім. сувязі. Узніклі 2 метады апісання будовы электронных абалонак малекул: метад валентных сувязей (В. Гайтлер, Ф. Лондан, пазней Дж. Слейтэр і Л. Полінг) і метад малекулярных арбіталяў (Ф. Гунд, Р. Малікен і інш.) — асноўны для апісання будовы абалонак любых малекул і колькаснага разліку малекулярных структур. З яго дапамогай паспяхова вырашаецца праблема вызначэння сувязі паміж будовай малекул і іх рэакцыйнай здольнасцю.

Літ.: Давтян О. К. Квантовая химия, М., 1962.

У. С. Каралькоў. Мінск.

КВАНТАВАЯ ЭЛЕКТРАДЫНАМІКА, квантавая тэорыя *электрамагнітнага поля* і яго ўзаемадзеяння́ў з зараджанымі часцінкамі.

Адна з фундаментальных уласцівасцей эл.-маги. поля — здольнасць існаваць у форме эл.-маги. хваляў, якія распаўсюджваюцца са скорасцю святла (Дж. Максвел, 1873). Прыватныя выпадкі гэтых хваляў — *цеплавое выпрамяненне*, *святло*, *радыёхвалі*, *рэнтгенаўскія прамяні* і *гама-выпрамяненне*. Другая пайб. важная яго ўласцівасць — квантаванасць (гл. *Фатон*) — адкрыта пры аналізе асаблівасцей цеплавога выпрамянення (М. Планк, 1900) і заканамернасцей *фотаэфекту* (А. Эйнштэйн, 1905). К. э. пачала афармляцца як самастойная тэорыя, незалежная ад квантавай механікі, калі П. Дзірак, апіраючыся на створаную ім рэлятывісцкую квантавую механіку электронаў (1927), вырашыў асн. задачы іх узаемадзеяння з эл.-маги. полем: рассеянне фатона электронам (*Комптана з'ява*), утварэнне і анігіляцыя электронна-пазітронных пар. Малая велічыня канстанты $e^2/\hbar c = {}^1/_{137}$ (e — зарад электрона), якая характарызуе ўзаемадзеянне зарадаў з эл.-маги. полем, дала магчымасць пабудаваць К. э. на падставе тэорыі ўзбурэнняў у адпаведнасці з вопытам ужо ў першым прыбліжэнні. Аднак у вышэйшых прыбліжэннях атрымліваліся бясконцыя выразы, што не мела сэнсу. Гэтая цяжкасць у асн. пераадолена (1949) Ю. Швінгерам, Р. Фейнманам і інш.

У К. э. эл.-маги. поле апісваецца 4-мерным вектарам-патэнцыялам A, які задавальняе *Максвела ўраўненні*, а электроны і пазітроны — таксама 4-мернай хвалевай функцыяй (біспінорам) ψ, якая задавальняе ўраўн. Дзірака. Функцыі A і ψ можна раскласці на рады (інтэгралы) Фур'е па плоскіх хвалях, кожнай з якіх адпавядае фатон ці электрон. Каэф. гэтага раскладання разглядаюцца як матрычныя аператары двух тыпаў: адны апісваюць нараджэнне часцінак, другія — знішчэнне. Т. ч. палявыя функцыі A і ψ таксама набываюць аператарны характар (другаснае квантаванне). Напр., працэс рассеяння фатона на электроне ў такой трактоўцы можна апісаць як знікненне першапачатковых фатона і электрона ў выніку ўзаемадзеяння і наступнае нараджэнне гэтых часцінак у новых станах, г. зн. з інш. значэннямі *імпульсу*, *энергіі* і *спіну*. Бясконцая сукупнасць амплітуд імавернасцей пераходаў паміж усімі магчымымі пачатковымі і канечнымі станамі стварае т. зв. S-матрыцу (матрыцу рассеяння), знайсці якую — мэта кожнай задачы. Вылічэнне S-матрыцы ў К. э. праводзіцца на аснове тэорыі ўзбурэнняў, звычайна з дапамогай т. зв. дыяграм Фейнмана. Вялікую ролю ў К. э. адыгрывае паняцце *вакууму*. Пры наяўнасці часцінак вакуум «палярызуецца» і т. ч. робіць уплыў на ўзаемадзеянне паміж імі. Гэта спараджае шэраг тонкіх з'яў (анамальны маги. момант электрона, зрух энергетычных узроўняў электронаў у атамах і інш.), якія ў К. э. разлічваюцца з вялізнай дакладнасцю ў поўнай згодзе з эксперыментам. К. э. — найбольш распрацаваны і эксперыментальна абгрунтаваны раздзел *квантавай тэорыі поля*.

Літ.: Ахиезер А. И. и Берестецкий В. Б. Квантовая электродинамика, 3 изд., М., 1969; Моров Л. Г. и Федоров Ф. И. Матрица рассеяния с учетом взаимодействия Паули, «Журнал экспериментальной и теоретической физики», 1960, т. 39, в. 8. *Ф. І. Фёдараў.* Мінск.

КВАНТАВАЯ ЭЛЕКТРОНІКА, раздзел фізікі, які вывучае працэсы генерацыі і ўзмацнення эл.-магн. хваляў, што адбываюцца на аснове *індуцыраванага выпрамянення* квантавых сістэм (атамаў і малекул). К. э. ўзнікла на стыку фіз. оптыкі, спектраскапіі і радыёфізікі.

Працэс вымушанага (індуцыраванага) выпрамянення эл.-магн. хваляў адкрыў А. Эйнштэйн (1917). На магчымасць выкарыстання гэтай з'явы для ўзмацнення святла паказаў В. А. Фабрыкант (1939); М. Г. Басаў, А. М. Прохараў (СССР) і незалежна Ч. Таўнс (ЗША) у 1954 стварылі першы генератар, які працаваў па гэтым прынцыпе,— малекулярны генератар на аміяку. У 1960 створаны першы *лазер* на рубіне, у 1961 — газавы лазер на сумесі неону з геліем, у 1962 — паўправадніковы лазер. У Ін-це фізікі АН БССР у 1964 выказана, а ў 1966 пацверджана думка, што актыўным элементам аптычнага квантавага генератара могуць быць растворы складаных арган. злучэнняў.

Асн. аб'екты вывучэння К. э.: актыўныя асяроддзі і *аб'ёмныя рэзанатары, квантавыя генератары* і *квантавыя ўзмацняльнікі*, паўправадніковыя частаты і метады кіравання лазерным прамянём. У сферу К. э. ўваходзяць пытанні ўзаемадзеяння магутнага лазернага выпрамянення з рэчывам, а таксама выкарыстанне лазерных сістэм у навуцы, тэхніцы і медыцыне. На базе К. э. ўзніклі *нелінейная оптыка* і *лазерная спектраскапія*, новы імпульс да развіцця атрымала *галаграфія*. Прагрэс К. э. звязаны перш-наперш з разнастайнымі магчымасцямі яе практ. выкарыстання. На Беларусі пытанні К. э. вывучаюцца ў Ін-це фізікі і ў Лабараторыі электронікі АН БССР, у БДУ і інш.

Літ.: Квантовая электроника, М., 1969 (Маленькая энциклопедия); Грибковский В. П. и Чекалинская Ю. И. Удивительный мир лазеров, Мн., 1968; Вертен Ф. Основы квантовой электроники, пер. с франц., М., 1971. *В. І. Сцяпанаў.* Мінск.

КВАНТАВЫ ГЕНЕРАТАР, крыніца кагерэнтных эл.-магн. хваляў, дзеянне якой заснавана на выкарыстанні з'яў *індуцыраванага выпрамянення*. К. г., якія працуюць у радыёдыяпазоне спектра, наз. мазерамі; К. г. інфрачырвонага, бачнага і ультрафіялетавага дыяпазонаў наз. *лазерамі*. Асн. элементы К. г.: актыўнае рэчыва, крыніца ўзбуджэння (помпаўка) і *аб'ёмны рэзанатар*. Помпаўка (гл. *Аптычная помпаўка*) пераводзіць актыўнае рэчыва ў інверсны стан, які характарызуецца ўласцівасцю ўзмацняць эл.-магн. выпрамяненне. Помпаўка рэчыва ажыццяўляецца аптычнымі, эл. і хім. метадамі. Рэзанатар служыць для ўтварэння адваротнай сувязі: частка ўзмоцненага выпрамянення з дапамогай люстэркаў вяртаецца ў актыўнае рэчыва і там зноў узмацняецца. Калі сярэдні каэф. узмацнення перавышае сярэдні каэф. страты рэзанатара, то ў сістэме ўзнікае генерацыя выпрамянення.

К. г. прынцыпова адрозніваюцца ад усіх інш. тыпаў крыніц эл.-магн. хваляў. Выпрамяненню К. г. (лазерны прамень) характэрны высокая накіраванасць, кагерэнтнасць і ў большасці выпадкаў высокая монахраматычнасць. Радыяцыя К. г. можа быць у выглядзе імпульсаў кароткай і звышкароткай (некалькі *псек*) працягласці і адпаведна звышвялікай магутнасці ў імпульсе (да некалькіх *Гвт*). У многіх выпадках рэжым генерацыі стацыянарны. У якасці актыўных асяроддзяў у К. г. выкарыстоўваюць цвёрдыя целы (рубін, паўправаднікі), вадкасці (растворы складаных арган. злучэнняў), газы (сумесь неону з геліем, вуглякіслы газ). У большасці цвёрдацелых К. г. інверсны стан атрымліваецца дзякуючы накапленню часцінак на т. зв. метастабільным узроўні. Вядома некалькі соцень тыпаў К. г., якія даюць магчымасць атрымаць лазернае выпрамяненне з розпай даўжынёй хвалі. У *лазерах на арганічных злучэннях* можна лёгка перабудаваць частату выпрамянення. К. г. выкарыстоўваюцца ў розных галінах навукі, тэхніці і медыцыны. Гл. таксама *Квантавая электроніка*.

Літ.: Методы расчета оптических квантовых генераторов, под ред. Б. И. Степанова, т. 1—2, Мн., 1966—68. *Б. І. Сцяпанаў.* Мінск.

КВАНТАВЫЯ ЛІКІ, лічэльныя або паўлічэльныя лікі, якія характарызуюць пэўныя станы квантавых аб'ектаў (атамаў, малекул, ядраў, элементарных часцінак).

Вызначаюцца ўласнымі значэннямі аператараў, якія атрымліваюцца пры *квантаванні* адпаведных фіз. велічынь. Напр., у *квантавай механіцы* стан асобнага электрона ў атаме вызначаецца 4 фіз. велічынямі (энергіяй, арбітальнай колькасцю руху, праекцыяй спінавага і магнітнага моманту) і залежыць ад 4 К. л. адпаведна: галоўнага, арбітальнага, магнітнага (цэлыя) і праекцыі *спіну* (паўцэлы). У фізіцы элементарных часцінак К. л. класіфікуюць часцінкі па тыпах і групах (напр., *барыёны, мезоны*, дзіўныя часцінкі) і вызначаюць імавернасці розных рэакцый паміж імі.

У. М. Траццякоў. Мінск.

КВАНТАВЫЯ ЎЗМАЦНЯЛЬНІКІ, прылады, у якіх адбываецца кагерэнтнае ўзмацненне эл.-магн. хваляў за кошт *індуцыраванага выпрамянення* актыўнага рэчыва. Гэтае выпрамяненне па частаце, фазе і палярызацыі аднолькавае з узмацняльным сігналам (кагерэнтнае ўзмацненне — гл. *Кагерэнтнасць*).

Спачатку былі створаны К. ў. радыёдыяпазону, потым інфрачырвонага і бачнага дыяпазонаў, дзе спосабы кагерэнтнага ўзмацнення раней не былі вядомыя. Каб павялічыць каэфіцыент узмацнення, актыўнае рэчыва змяшчаюць у рэзанатар, што забяспечвае шматразовае праходжанне выпрамянення ў ім (рэгенератыўныя К. ў.). У радыёдыяпазоне ўжываюцца закрытыя рэзанатары, памеры якіх параўнальныя з даўжынёй хвалі, а ў аптычным дыяпазоне — адкрытыя рэзанатары, значна большыя за даўжыню хвалі. Асн. характарыстыкі К. ў.: каэфіцыент узмацнення, палоса прапускання і адчувальнасць. Велічыня адчувальнасці К. ў. абмяжоўваецца шумамі (у аптычным дыяпазоне гэта пераважна *спантаннае выпрамяненне* актыўнага рэчыва, у радыёдыяпазоне — цеплавое). З-за нізкага ўзроўню шуму К. ў. павялічваюць адчувальнасць прыёмных прылад у 50—200 разоў.

Радыёхвалевыя К. ў. шырока выкарыстоўваюць у сістэмах сувязі праз рэтрансляцыйныя спадарожнікі. У радыёастраноміі К. ў. далі магчымасць значна скараціць неабходны час назірання астранамічных аб'ектаў (напр., для Венеры ў 40 разоў). З дапамогай К. ў. зроблены многія фундаментальныя адкрыцці ў радыёастраноміі. Адкрыты міжзорны вадарод у інш. галактыках, а таксама *рэліктавае радыёвыпрамяненне*. На Беларусі работы па даследаванні К. ў. у аптычным дыяпазоне вядуцца ў Ін-це фізікі АН БССР. Гл. таксама *Лазер, Квантавая электроніка, Квантавы генератар*.

Літ.: Методы расчета оптических квантовых генераторов, под ред. Б. И. Степанова, т. 1—2, Мн., 1966—68; Косырев Е. А. Шаги квантовой электроники, М., 1970; Карлов Н. В. Исследования по квантовым усилителям, «Труды Физического ин-та АН СССР», 1969, т. 49; Басов Н. Г. и др. Регенеративные оптические квантовые усилители, там жа, 1965, т. 31. *Ю. І. Чакалінская.* Мінск.

КВАНТАРЫ (ад лац. quantum колькі), апératары, якія выяўляюць пры вылічэннях у логіцы колькасную характарыстыку прадметаў, пра якія гаворыцца ў выказваннях, або іх продыкатаў.

Найб. значэнне маюць К. агульнасці (сімвал ∀ — перавернутае А ад англ. all, ням. alle — усе) і К. існавання (сімвал ∃ — перавернутае Е ад англ. exist, ням. existieren — існаваць). У звычайнай мове К. агульнасці адпавядаюць словы «ўсе», «ўсякі», «кожны», «любы», «бясконца многа» і інш.; К. існавання — «некаторы», «некалькі», «існуе», «адзіны» і інш. У лагічных вылічэннях К. ператвараюць свабодныя пераменныя ў звязаныя. З дапамогай К. 4 асн. формы суджэнняў («Усе А ёсць В», «Ні адно А не ёсць В», «Некат. А ёсць В» і «Некат. А не ёсць В») запісваюцца ў выглядзе формул (дзе ∧ знак кан'юнкцыі, → знак імплікацыі, ¬ знак адмаўлення): $\forall x[A(x) \to B(x)]$; $\forall x[A(x) \to \overline{B(x)}]$; $\exists x[A(x) \,\&\, B(x)]$; $\exists x[\overline{A(x) \,\&\, B(x)}]$. Аперацыю ўжывання К. наз. падвядзеннем пад К. (выядзеннем з-пад К.) або квантыфікацыяй. Над выразамі з К. можна рабіць усе аперацыі ў вылічэннях прадыкатаў, а таксама размяркоўваць К. па членах складанага выразу, перастаўляць іх і рабіць інш. дзеянні ў адпаведнасці з законамі *матэматычнай логікі*.

Літ.: Гл. пры арт. *Вылічэнне прэдыкатаў, Матэматычная логіка.* *П. Дз. Пузікаў.* Мінск.

КВАРАНІН, лякарства, тое, што *кафеін*.

КВАРКІ, тэарэтычна дапушчальныя мікраб'екты, магчымыя састаўныя часткі *элементарных часцінак*.

Гіпотэза пра існаванне К. узнікла ў 1964 у схеме унітарнай сіметрыі (гл. *Адроны*). Найб. вядомая мадэль К. прыпісвае ім дробны эл. зарад ($\pm\frac{1}{3}$ ці $\pm\frac{2}{3}$ у адзінках зараду электрона). Паводле гэтай мадэлі нуклоны складаюцца з трох К., а π-, K- і іншыя мезоны — з кварка і антыкварка (гл. *Антычасцінка*). Энергія сувязі К. у часцінках парадыяльная з энергіяй спакою К., калі маса К. перавышае нуклонную. Пошукі К. да гэтага часу не далі поспеху, калі не лічыць 6 вельмі супярэчлівых выпадкаў выяўлення К. у *касмічных прамянях*.

Літ.: Кокседэ Я. Теория кварков, пер. [з англ.], М., 1971. *І. С. Саўпкевіч.* Мінск.

КВАРТА (лац. quarta чацвёртая), адзінка вымярэння сыпкіх рэчываў і вадкасцей у сістэме мер Вял. кн. Літ.— 0,70577 літра (4 кварты складаюць *гарнец*).

КВАРТА ў музыцы, *інтэрвал*, які ахоплівае 4 ступені.

КВАРТНІК, сярэбраная манета ў 1,5 *грошы*=¼ скойца=1/96 польскай *грыўні* ў 13—15 ст. на тэр. Польшчы, у 16 ст.— Рэчы Паспалітай. З канца 14 ст. К. адпавядаў тром *дэнарыям* і называўся тэрнарыем.

Чаканілася некалькі разнавіднасцей К.: сілезскі (маса каля 1,7 *г*), упершыню ўпамінаецца каля 1294 (да 1325—30); кракаўскі (маса каля 1,6 *г*, каля 1337—1403); львоўскі, або рускі (маса 1,6 *г*, 1340—79), аўтаномная манета Галіцкай Русі; паморскі (маса каля 0,46 *г*), чаканіўся ў Шчэціне, а пазней і ў інш. гарадах Зах. Памор'я з 1408 да 16 ст.

Літ.: Котляр М. Ф. Галицька Русь у другій половині XIV — першій чверті XV ст., Київ, 1968; Kiersnowski R. Wstęp do numizmatyki polskiej wieków średnich, Warszawa, 1964. *В. Н. Рабцэвіч.* Мінск.

КВАРТЭТ (італьян. quartetto ад лац. quarta чацвёрты), 1) *ансамбль* з 4 выканаўцаў. 2) Музычная п'еса для ансамбля з 4 выканаўцаў.

Найб. пашыраны смыковыя К. (для 2 скрыпак, альта і віяланчэлі), якія пішуцца звычайна ў самернай музыцы. Класічныя ўзоры смыковых К. створаны І. Гайднам, В. А. Моцартам, Л. Бетховенам. У рус. музыцы найб. вядомыя квартэты А. Барадзіна, П. Чайкоўскага, С. Танеева, А. Глазунова. Пачынальнік квартэтнага жанру ў бел. музыцы М. Чуркін (усяго 11 К., першы у 1928); К. пісалі І. Лучанок, П. Падкавыраў, А. Туранкоў, К. Цесакоў, В. Яфімаў і інш. бел. кампазітары.

КВАРЦ, мінерал, двухвокіс крэмнію SiO_2, адзін з асн. пародаўтваральных мінералаў зямной кары. Выкарыстоўваецца ў радыётэхніцы, шклокерамічнай, металург. прамысловасці, у аптычных вырабах, афарбаваны — у ювелірнай справе.

Крышталізуецца ў трыганальнай сістэме. Вылучаюць некалькі мадыфікацый іншых сістэм, скрытакрышталічныя рознасці (гл. *Халцэдон*). Крышталі прызматычныя ці дыпірамідальныя, з папярочнай штрыхоўкай на гранях, часта ўтвараюць зрасткі (гл. *Друза*). У горных пародах трапляецца ў зернях няправільнай формы. Бывае праз рысты і паўпразрысты; рознай афарбоўкі: фіялетавы — *аметыст*, дымкавы — раўхтапаз, жоўты — цытрын, чорны — марыён, бясколерны — *горны хрусталь*. Цв. 7,0. Крохкі; бляск шкляны; шчыльн. 2650 *кг/м*³. П'езаэлектрычны. Паходжанне пераважна эндагеннае. На Беларусі шматлікія радовішчы кварцавых пяскоў. Радовішчы К. ў СССР (Урал, Украіна і інш.), у Бразіліі, краінах Зах. Еўропы (Альпы), на Мадагаскары, Цэйлоне, у Бірме.

Літ.: Лазаренко Е. К. Курс минералогии, 2 изд., М., 1971.

КВАРЦЫТ, горная парода, складзеная пераважна з кварцу. Утвараецца ад метамарфізму кварцавых пясчанікаў і некат. магматычных парод. Выкарыстоўваецца для вытворчасці вогнетрывалай цэглы — дынасу, як кіслотатрывалы буд. матэрыял і як флюс у каляровай металургіі.

К. другасныя — прадукт гідратэрмальна-метасаматычнай перапрацоўкі пераважна кіслых вывергнутых парод. Складзены з кварцу і прымесяў інш. мінералаў. Змяшчаюць радовішчы медзі, волата, серабра, сернага калчадану, гліназёмнай сыравіны (алуніту, карунду) і інш. Трапляюцца ў Сярэдняй Азіі, Казахстане, на Каўказе, Урале.

Літ.: Наковник Н. И. Вторичные кварциты СССР и связанные с ними месторождения полезных ископаемых, 2 изд., М., 1968.

КВАРЭНГІ, Гварэнгі (Quarenghi) Джакома [20 або 21.9.1744, Валє-Іманья, каля Бергама ў Ламбардыі — 18.2(2.3).1817], архітэктар і графік. Прадстаўнік рус. класіцызму. Італьянец па паходжанні. У Расіі з 1780. Работам К. ўласцівыя яснасць планіровачных вырашэнняў, прастата і дакладнасць аб'ёмных кампазіцый, манументальная пластычнасць формаў. Сярод работ: Англійскі палац у Пецяргофе (1781—94, разбураны ням.-фаш. захопнікамі ў 1942), Аляксандраўскі палац (1792—96) у Царскім Сяле (сучасны Пушкін); будынкі Акадэміі навук (1783—89), Асігнацыйнага банка (1783—90), Эрмітажнага т-ра (1783—87), Кацярынінскага ін-та (1804—06), Смольнага ін-та (1806—09; усе ў Ленінгра-



дзе). Графічныя работы: рысункі «Церамны палац у Крамлі», «Міхайлаўскі замак», «Катанне па лёдзе на Няве» і інш. Выдаў гравіраваныя альбомы са сваіх праектаў (1787 і 1791).

Літ.: Талепоровский В. Н. Кваренги, Л.—М., 1954; Гримм Г. Г. Графическое наследие Кваренги, Л., 1962.

КВАС, напітак з заквашанага жытняга цеста ці хлеба з соладам, з сухароў. На Беларусі робяць таксама К. з садавіны і ягад — яблычны, слівавы, грушавы, журавінны, бруснічны, з бярозавага соку *(бярозавік)*.

КВАСЕВІЧЫ, вёска ў Верашкоўскім с/с Іванцэвіцкага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр саўгаса «Зара». За 20 *км* на З ад Іванцэвічаў, 140 *км* ад Брэста, аўтамаб. дарогай злучана з Іванцэвічамі і г. п. Ружаны. 889 ж., двароў 289 (1971). Цагельня, майстэрня камбіната быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, дзіцячыя яслі-сад, урачэбная амбулаторыя, адд. сувязі, сталовая, 2 магазіны. У ліп. 1944 ням.-фаш. захопнікі спалілі 50 двароў вёскі, расстралялі 12 жыхароў.

КВАСОЎКА, вёска ў Гродзенскім р-не. Цэнтр сельсавета і калгаса «Кастрычнік». За 20 *км* на Пд ад Гродна, на аўтамаб. дарозе Гродна — в. Лунна. 332 ж., гасп. 98 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, вет. пункт, адд. сувязі, 2 магазіны.

КВАТАРЫ, вёска ў Бераставіцкім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Авангард». За 17 *км* на ПдУ ад Вял. Бераставіцы, 80 *км* ад Гродна, 7 *км* ад чыг. ст. Бераставіца, на аўтамаб. дарозе Ваўкавыск—в. Бераставіца. 263 ж., гасп. 95 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, адд. сувязі, магазін.

КВАТЭРКА, адзінка вымярэння вадкасцей у сістэме мер Вял. кн. Літоўскага. К.— 0,17644 літра (у адной *кварце* 4 кватэркі).

КВАТЭРНІЕНЫ (ад лац. quaterni па чатыры), адна з сістэм *гіперкомплексных лікаў*. Увёў у 1843 У. Р. Гамільтан у сувязі з задачай абагульнення *комплексных лікаў*.

К. вызначаюцца як множства ўсіх выразаў віду $a+bi+cj+dk$, дзе a, b, c, d — сапраўдныя лікі, i, j, k — сімвалы. Множанне і складанне К. адбываецца паводле тых жа правілаў, што множанне і складанне многачленаў, з улікам наст. правілаў множання для i, j, k: $i^2=j^2=k^2=-1$, $jk=-kj=i$, $ki=-ik=j$, $ij=-ji=k$. Алг. дзеянні над К. маюць усе ўласцівасці (выключаючы *камутатыўнасць* множання) адпаведных дзеянняў над сапраўднымі лікамі. Гэтым К. вылучаюцца сярод усіх сістэм гіперкомплексных лікаў.

Літ.: Молодший В. Н. Основы учения о числе в XVIII и начале XIX века, М., 1963; Арнольд И. В. Теоретическая арифметика, 2 изд., М., 1939.

КВАЧАНТЫРАДЗЕ Васіль Шалвавіч [13 (26).6.1907, с. Канчкаты Азургецкага пав. Кутаіскай губ.— 9.2.1950], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1939. На фронце з 1941, снайпер. Вызначыўся ў Віцебскай вобл. 23—27.6.1944 пры прарыве абароны праціўніка каля г. п. Шуміліна і ў час разгрому акружанай віцебскай групоўкі ворага знішчыў 44 гітлераўцаў. Усяго за гады вайны знішчыў 534 варожых салдат і афіцэраў.

КВАШАНІНА, халодная страва, тое, што *студзіна*.

КВЕТКА, укарочаны неразгалінаваны відазменены парастак; орган *пакрытанасенных*, з дапамогаю якога адбываецца палавое размнажэнне. Развіваецца з пупышкі. У К. ўтвараюцца споры і гаметы, адбываецца *апыленне* і *апладненне*. З частак К. развіваецца плод з насеннем.

Складаецца К. з кветаножкі (частка сцябла, якая нясе К.), кветаложа (вось К., ля ўкарочаная сцябловая частка), чашачкі (вонкавае метамарфізаванае лісце, якое ахоўвае нераскрытую кветку — бутон), вяночка (пялёсткі размешчаны па спіралі, або кальчакамі, ім належыць вял. роля ў апыленні — яркі колер і пах прывабліваюць насякомых), андрацэя (сукупнасць тычынак, кожная з якіх мае тычынкавую ніць і пыльнік), гінецэя (сукупнасць пладалісцікаў, якія зрастаюцца і ўтвараюць адзін або некалькі песцікаў, кожны з іх мае рыльца, слупок, завязь, унутры завязі — семязавязь, з якой пасля цвіцення развіваецца насенне, а з завязі ўтвараецца плод). Адрозніваюць К. правільныя, ці актынаморфныя — вяночак можна падзяліць некалькімі плоскасцямі сіметрыі на аднолькавыя часткі (лён, капуста, казялец, яблыня); няправільныя, ці зігаморфныя — можна правесці толькі адну плоскасць сіметрыі (браткі, гарох, ільвіны зеў); асіметрычныя — праз вяночак нельга правесці ніводнай плоскасці сіметрыі (валяр'ян, кана). К. бываюць двухполыя — маюць тычынкі і песцікі (такіх кветак у прыродзе каля 75%); аднаполыя — маюць толькі тычынкі (мужчынскія кветкі) або толькі песцікі (жаночыя кветкі). Расліны з тычынкавымі і песцікавымі К.— аднадомныя (дуб, бяроза, кукуруза), іх 5—8%. Расліны, у якіх тычынкавыя і песцікавыя К. размешчаны на розных раслінах, быццам у розных дамах — двухдомныя (каноплі, асіна, вярба, шпінат), іх да 3—4%. Есць шматдомныя (палігамныя) расліны, у іх на адной расліне двухполыя і аднаполыя кветкі (грэчка, ясень, клён), такіх раслін да 10—20%. К. бываюць верхавінкавыя (размешчаны на верхавінцы сцябла) і пазушныя (развіваюцца ў пазухах лісця); адзіночныя і сабраныя ў *суквецці*. У шмат якіх раслін К. адкрытыя толькі ўдзень або толькі ўначы. Цвітуць расліны ад 20—30 *мін* (гарлачык амазонскі) да 80 дзён (пекат. архідэі). Пасля апылення К. гіне. Для кароткага абазначэння будовы К. выкарыстоўваюць формулы і дыяграмы. Формула К.— літарнае абазначэнне асобных частак кветкі з дапамогай пачатковых літар лац. назваў гэтых частак. Просты калякветкнік (чашачка і вяночак) абазначаецца літарай P (Perigonium), чашачка — Ca (Calix), вяночак — Co (Corolla), андрацэй — A (Androeceum), гінецэй — G (Gynoeceum). Колькасць членаў К. ў кожным крузе абазначаецца лічбамі і спец. ўмоўнымі значкамі: вялікая колькасць знакам (∞), зрослыя часткі К.— дужкамі, верхняя завязь — рыскаю над лічбаю гінецэя, ніжняя — рыскаю пад лічбаю гінецэя. Няправільная К. абазначаецца стрэлкаю, а правільная ворачкай. Дыяграма К.— праекцыя частак кветкі на гарызантальную плоскасць.



Кветка I. 1. Будова двухполай кветкі (а — кветалажа, б — чашалісцікі, в — пялёсткі вяночка, г — тычынкі, д — рыльца песціка, е — завязь, ж — семязавязь). 2—17. Кветка: 2—3. Аднаполая (2 — тычынкавая, 3 — песцікавая); 4. Правільная; 5. Няправільная; 6. Асіметрычная; 7. Трубчастая; 8. Язычковая; 9—17. Вяночак: 9. Раздзельнапялёсткавы; 10—14. Спайнапялёсткавы (10 — лейкападобны, 11 — двухгубы, 12 — колападобны, 13 — званочкападобны, 14 — трубчаста-лейкападобны); 15. Матыльковы; 16. Вяночак са шпоркамі; 17. Крыжападобны. 18. Дыяграма кветкі (а — ліст, б — прыкветнік, в — чашачка, г — вяночак, д — тычынкі, е — песцік, ж — сцябло). 19. Формулы кветак.



Кветка II. 1. Нарцыс. 2. Аканіт. 3. Мак. 4. Адоніс. 5. Касач. 6. Гваздзік. 7. Паслён. 8. Гарычка. 9. Шафран. 10. Зопнік. 11. Смалёўка. 12. Лотас. 13. Лілея. 14. Цюльпан. 15. Пшаніца. 16. Руža. 17. Красадзён. 18. Яснотка. 19. Кірказон. 20. Гарлачык жоўты. 21. Наперстаўка. 22. Мезембрыянтэмум. 23. Чаравічак.

касць; паказвае не толькі колькасць, але і адноснае размяшчэнне элементаў кветкі. Іл. гл. на ўкл.

Літ.: Курсанов Л. И. и др. Ботаника, т. 1, 2 изд., М., 1966; Жуковский П. М. Ботаника, 4 изд., М., 1964; Блукет Н. А. и Емцев В. Т. Ботаника с основами физиологии растений и микробиологии, М., 1969. *В. М. Прусакова.* Мінск.

КВЕТКАВОДСТВА, галіна раслінаводства, якая займаецца вырошчваннем кветкава- і лісцева-дэкаратыўных раслін. Асн. мэта — упрыгожванне садоў, паркаў, вуліц, плошчаў, сквераў, забеспячэнне насельніцтва кветкамі, азеляненне памяшканняў. Адрозніваюць К. адкрытага, ахоўнага грунту і пакаёвае.

Задачы К. на Беларусі практычна вырашаюць трэст зялёнага будаўніцтва (Мінск), прадпрыемствы зялёнай гаспадаркі ў абл. і раённых гарадах, некат. саўгасы (Мінская агароднінная фабрыка; «Гарадзішча» Мінскага р-на), доследная гаспадарка «Лошыца 1-я». Навук. асновы К. распрацоўваюцца ў Цэнтр. бат. садзе АН БССР, у Бел. НДІ садоўніцтва, агародніцтва і бульбы, дзе вывучаюцца біял. асаблівасці разнастайных відаў і сартоў *дэкаратыўных раслін*, каб вылучыць лепшыя з іх на азеляненне і выкарыстанне ў селекцыі; распрацоўваюцца рацыянальныя прыёмы вырошчвання, даюцца рэкамендацыі для зялёнага будаўніцтва.

Літ.: Тавлинова Г. К. Цветоводство, Л., 1970; Киселев Г. Е. Цветоводство, 3 изд., М., 1964; Мерло А. С. Советы цветоводам, Мн., 1967; Левданская П. И. и Мерло А. С. Комнатные цветочные растения, Мн., 1967.

Г. С. Мярло. Мінск.

КВЕТКАВЫЯ РАСЛІНЫ, тое, што *пакрытанасенныя.*

КВІНКЕ ХВАРОБА, адна з алергічных хвароб. Гл. *Алергія.*

КВІНТА ў музыцы (ад лац. quinta пятая), *інтэрвал*, які ахоплівае 5 ступеняў.

КВІНТЭТ (італьян. quintetto ад лац. quintus пяты), 1) *ансамбль* з пяці выканаўцаў. 2) Муз. п'еса для такога ансамбля. Найб. пашыраны смыковыя (для 2 скрыпак, 2 альтоў і віяланчэлі або для 2 скрыпак, альта і 2 віяланчэляў) і фп. К. (для 2 скрыпак, альта, віяланчэлі і фп.), якія пішуцца звычайна ў санатнай цыклічнай форме.

КВІСЛІНГ (Quisling) Відкун (18.7.1887—24.10.1945), лідэр нарвежскіх фашыстаў. У 1933 арганізаваў фаш. партыю «Нац. аб'яднанне». Спрыяў здрадніцкаму захопу Нарвегіі фаш. Германіяй у крас. 1940. У 1942 прызначаны гітлераўцамі кіраўніком нарв. марыянетачнага ўрада; бязлітасна распраўляўся з нарв. патрыётамі. Пасля вызвалення Нарвегіі ад акупацыі пакараны смерцю па водле прыгавору нарв. суда. Імя К. стала назоўным для здраднікаў і катаў свайго народа.

КВІТКА Клімент Васілевіч [23.1(4.2).1880, в. Хмялёва Роменскага пав. Палтаўскай губ.— 19.9.1953], украінскі і рускі даследчык і збіральнік нар. музыкі, заснавальнік сав. школы параўнальнага музыказнаўства. Праф. муз.-драм. ін-та імя Лысенкі ў Кіеве (з 1920), Маск. кансерваторыі (з 1933). Найб. значныя працы ў галіне метадалогіі музыказнаўчага даследавання фальклору. Прытрымліваўся думкі пра множнасць асяродкаў фарміравання самабытнай муз. культуры народаў свету. Вывучаў ладаўтварэнне, рытміку, жанравую структуру муз.-паэт. фальклору слав., фінаугорскіх, цюрк. і інш. народаў. Запісваў нар. песні на Беларусі.

Тв.: Избранные труды в 2-х т., т. 1, М., 1971; Об областях распространения некоторых типов белорусских календарных и свадебных песен, у зб.: Белорусские народные песни, М.—Л., 1941 (Песни народов СССР).

Літ.: Бачинский Л., К. В. Квитка. [Некралог], у зб.: Вопросы музыкознания, в. 2, М., 1955. *Л. С. Мухарынская.* Мінск.

КВІТКА-АСНАЎЯНЕНКА Рыгор Фёдаравіч [літ. псеўд. Аснаўяненка Грыцко; 18(29).11.1778, с. Аснова каля Харкава — 8(20).8.1843], украінскі пісьменнік, пачынальнік новай укр. прозы. Сын памешчыка. Адзін з выдаўцоў і рэдактараў час. «Украинский вестник» (1816—17), кіраваў Харкаўскім т-рам. Літ. дзейнасць пачаў у 1816. Пісаў на рус. і ўкр. мовах. Аповесці К.-А. на ўкр. мове паявіліся ў альманаху «Утренняя звезда» (1833). Выдаў «Маларасійскія аповесці, расказаныя Грыцком Аснаўяненкам» (кн. 1, 1834, кн. 2, 1837). Асн. герой апавяданняў і аповесцей 30—40-х г.— селянін. Паказаў цяжкія ўмовы жыцця народа («Маруся», 1834; «Козыр-дзеўка», 1838; «Божыя дзеці», 1840). Побач з рэаліст. элементамі апавяданні і аповесці К.-А. праслізнуты дыдактызмам, хрысц. мараллю пакоры. Аўтар п'ес «Прыезджы са сталіцы» (1827, апубл. 1840), «Сватанне на Ганчароўцы» (1836, паст. ў Мінску гар. т-рам у 1848), «Шальменка-дзяншчык» (1840) і інш., гістар. нарысаў («Галаваты», 1839; «Украінцы», 1841).

Тв.: Твори, т. 1—8, Київ, 1969—70; Пан Халявский, М., 1971.

Літ.: Чалий Д., Г. Ф. Квітка-Основ'яненко, Київ, 1962; Гончар О. І. Григорий Квітка-Основ'яненко, Київ, 1969.

КВІТКОЎ Аляксандр Спірыдонавіч (н. 15.12.1922, с. Жалезінка Паўладарскага пав. Сяміпалацінскай вобл.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1946. На фронце з 1943. Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра каля в. Галкі Камарынскага р-на Палескай вобл. У ноч на 27.9.1943 уплаў і ўброд аддзяленне на чале з К. дабралася да берага, у рукапашным баі выбіла ворага з траншэі і адбіла 3 контратакі. Жыве ў г. Балашыха Маскоўскай вобл.

КВІТОВІЧ Дзмітрый Канстанцінавіч (н. 15.1.1923, в. Шарлоўка Ачынскага пав. Енісейскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). Чл. КПСС з 1943. На фронце з 1941. Вызначыўся ў Гомельскай вобл. У кастр. 1943 ст. лейтэнант К. з групай воінаў фарсіраваў Дняпро каля Лоева, уварваўся ў варожыя траншэі, замацаваўся на плацдарме, гэтым памог пераправе палка. Жыве ў Кемераве.

КВІЦІНСКІ Вячаслаў Антонавіч (н. 25.11.1920, в. Антавільна Лепельскага пав. Віцеб-



скай губ.), Герой Сав. Саюза (1945). З сялян. Чл. КПСС з 1945. Скончыў Кіеўскі ун-т (1950). У Чырв. Арміі з 1939. Удзельнік сав.-фінляндскай вайны 1939—40. У Айч. вайну на Паўд.-Зах. фронце. З кастр. 1941 чл. Наваград-Валынскай падпольнай арг-цыі. З чэрв. 1942 у 1-м Валынскім партыз. атрадзе — кулямётчык, старшы дыверсійнай групы, камандзір атрада. Атрад пад кіраўніцтвам К. на Украіне і Беларусі з студз. 1944 праводзіў дыверсіі на чыг. лініях Брэст — Ковель, Брэст — Пінск. 27.6.1944 атрад высаджаны ў Драгобыцкай вобл. для супольнай партыз. барацьбы з польскімі, чэшскімі і славацкімі патрыётамі; фарсіраваў Сан і праводзіў у Польшчы баявыя аперацыі; з 9.8.1944 атрад у Чэхаславакіі, ператвораны ў асобную партыз. брыгаду імя К. Готвальда, якая пад камандаваннем К. ўдзельнічала ў Славацкім паўстанні 1944, ажыццявіла 156 баявых аперацый. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, ордэнам Чырв. Сцяга, медалямі, ордэнам ПНР, 4 ордэнамі ЧССР. Ганаровы грамадзянін г. Наваград-Валынска, Бардзіева (ЧССР). Жыве ў Кіеве.

Тв.: Фронт без тылу. Київ, 1971.
Літ.: Люди легенд, в. 4, М., 1971, с. 158—172.

КВОРУМ (лац. quorum літаральна якіх), прадугледжаная законам або інш. прававым актам, статутам, рэгламентам ці пастановай пэўнай арганізацыі найменшая колькасць членаў гэтай арганізацыі, прысутнасць якіх неабходная, каб адкрыць пасяджэнне ці сход і прыняць правамоцныя рашэнні. Напр., зменьі ў Канстытуцыі БССР робяцца толькі паводле рашэння Вярх. Савета БССР, прынятага большасцю, не менш як дзве трэці, галасоў.

КВОТА (позналац. quot колькі), 1) адна з найважнейшых умоў картэльнага пагадненя, якая азначае долю ўдзелу ў вытворчасці, збыце або экспарце. 2) Памер падатку, які спаганяецца з адзінкі абкладання. 3) Доля, частка, норма чаго-н., якая дапускаецца (імпартная К.).

КЕГЕЛЬ, кегль (ням. Kegel), памер друкарскага шрыфту, які ўключае вышыню літары (вочка) і т. зв. заплечыкі — свабодную прастору над і пад вочкам у прамежках паміж радкамі тэксту.

Вымяраецца К. у друкарскіх пунктах (пункт роўны 0,376 *мм*) ці квадратах (48 пунктаў). У СССР ужываюцца шрыфты наступных К.: 5; 6 (нанпарэль); 7; 8 (петыт); 9 (боргес); 10 (корпус); 12 (цыцэра); 14; 16; 20; 24; 28 і 36 пунктаў, а таксама 1; 1¼; 1½; 2; 2½; 3; 4; 5; 6; 8; 10; 12 і 15 квадратаў. Тэкст артыкулаў БелСЭ набраны шрыфтам К. 8 і 6.

КЕДР, назва некат. вечназялёных хвойных раслін. 1) Кедр сапраўдны (Cedrus), род дрэў сям. хваёвых. 4 віды, пашыраны ў гарах М. Азіі, Цэнтр. Азіі, Паўн. Амерыкі, на в-ве Кіпр. У СССР (на Каўказе, у Крыме і Сярэдняй Азіі) культывуюць 3 віды: К. ліванскі (C. libani), К. атласкі (C. atlantica), К. гімалайскі (C. deodara). Усе віды выкарыстоўваюцца ў лесаразвядзенні, на лесамеліяратыўныя мэты і як дэкаратыўныя. Драўніна ідзе на выраб мэблі і на буд-ва.



Кедр атласкі: *1* — парастак з мужчынскімі каласкамі; *2* — луска з насеннем.

Аднадомныя дрэвы, выш. да 50 *м*. Ігліца трох-, чатырохгранная, цвёрдая, калючая, даўж. 15—50 *мм*. Шышкі прамастойныя, яйцападобныя, высыпаюць на другі — трэці год. Насенне смалістае, з вялікім крыльцам, нядомае. Ёсць формы з шыза-аліёнай і серабрыста-шэрай ігліцай.

2) Пашыраная, але няправільная назва некалькіх відаў 5-ігліцавых хвояў (К. сібірскі, К. еўрапейскі, К. маньчжурскі, кедравы сланік і інш.), пашыраных у Азіі і ў гарах Еўропы. Даюць ядомае насенне — кедравыя арэшкі. У СССР найб. вядомая сібірская кедравая хвоя — кедр сібірскі (Pinus sibirica); на Беларусі інтрадукавана. Дрэва выш. да 40 *м*, ігліца блакітная. З насення атрымліваюць кедравы алей. Драўніна каштоўная, ідзе на выраб мэблі, алоўкавых палачак, выкарыстоўваецца ў буд-ве.

Літ.: Деревья и кустарники СССР, т. 1, М.—Л., 1949; Колесников А. И. Декоративная дендрология, М., 1960. *Б. М. Прусакова.* Мінск.

КЕДРАЎ Баніфацый Міхайлавіч [н. 27.11(10.12).1903, Яраслаўль], савецкі філосаф. Акад. АН СССР (1966, чл.-кар. 1960). Чл. КПСС з 1918. Скончыў хім. ф-т Харкаўскага ун-та (1930). Дырэктар Ін-та гісторыі прыродазнаўства і тэхнікі АН СССР (з 1962). Аўтар прац па філас. пытаннях прыродазнаўства, дыялект. матэрыялізме, псіхалогіі, логіцы навук. творчасці, класіфікацыі навук. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, 2 інш. ордэнамі, медалямі.



Тв.: Предмет и взаимосвязь естественных наук, 2 изд., М., 1967; Классификация наук, т. 1—2, М., 1961—65; Единство диалектики, логики и теории познания, М., 1963; Эволюция понятия элемента в химии, М., 1956; О марксистской истории естествознания, М., 1968; Ленин и революция в естествознании XX века, М., 1969; Три аспекта атомистики, кн. 1—3, М., 1969; Фридрих Энгельс. Развитие его взглядов на диалектику естествознания. Научно-биографический очерк, М., 1970; Микроанатомия великого открытия, М., 1970; В. И. Ленин и диалектика развития естествознания, М., 1970.

КЕДРАЎ Міхаіл Мікалаевіч [9(21).12.1893, Масква — 22.3.1972], рускі савецкі рэжысёр, акцёр, педагог. Нар. арт. СССР (1948). З 1924 у трупе МХАТа. Лепшыя ролі: Сінь Біп-у («Браняпоезд 14—69» У. Іванава), Манілаў («Мёртвыя душы» паводле М. Гогаля), Захар Бардзін («Ворагі» М. Горкага), Тарцюф («Тартюф» Мальера) і інш. Як рэжысёр і педагог развівае традыцыі рэжысуры К. Станіслаўскага і У. Неміровіча-Данчанкі. Пастаноўкі: «Ворагі» (1936, з Неміровічам-Данчанкам), «Глыбокая разведка» А. Крона (1943), «Плён асветы» Л. Талстога (1951), «Трэцяя патэтычная» М. Пагодзіна (1958), «Рэвізор» М. Гогаля (1967). Дзярж. прэміі СССР 1946, 1949, 1950, 1952. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі.

Літ.: Михаил Николаевич Кедров. М., 1948.

КЕДРАЎ Міхаіл Сяргеевіч (1878, Масква — 1941), савецкі парт. і дзярж. дзеяч. З сям'і натарыуса. Чл. КПСС з 1901. У 1899 за рэвалюц. дзейнасць выключаны з Маск. ун-та. Удзельнік рэвалюцыі 1905—07 у Маскве, Катэрынаславе, Цверы, Пецярбургу. У 1908—11 за выданне зборнікаў У. І. Леніна і інш. нелегальнай л-ры зняволены ў крэпасці. У 1912 эміграваў, у 1916 па даручэнні У. І. Леніна вярнуўся ў Расію. У 1917 чл. Ваен. арг-цыі пры ЦК РСДРП(б) і Усерас. бюро бальшавіцкіх ваен. арг-цый, рэдактар газ. «Солдатская правда»; чл. калегіі Наркамата па ваен. справах. З жн. 1918 камандуючы войск Паўн.-Усх. ўчастка Зах. завесы, чл. РВС Паўн. фронту. З сак. 1919 старшыня Асобага аддзела ВЧК, чл. калегіі НКУС, упаўнаважаны ЦК РКП(б) па Паўд. і Зах. франтах. З 1924 на адказных пасадах у ВСНГ, наркамаце аховы здароўя, Вярх. судзе СССР.

Літ.: Викторов И. В. Подпольщик, воин, чекист. М., 1963; Самойло А. Две жизни, Л., 1963.

КЕДРАЎ-ЗІХМАН Аскар Карлавіч [19(31).12.1885, Курляндская губ.— 12.2.1964], беларускі савецкі аграхімік. Акад. АН БССР (1931), акад. УАСГНІЛ (1935). Засл. дз. н. БССР (1940). Чл. КПСС з 1919. Скончыў Кіеўскі ун-т (1913). Удзельнік грамадз. вайны. У 1923—30 праф. Горацкага с.-г. ін-та (з 1925 Бел. с.-г. акадэмія) і Маск. с.-г. акадэміі імя Цімірязева (1930—41). Кіраўнік лабараторыі вапнавання глебы Усесаюзнага НДІ ўгнаенняў і аграглебазнаўства (1931—63). Асн. працы па вапнаванні кіслых глебаў, вывучэнні ролі магнію ў вапнавых угнаеннях, уплыве вапны на біял. якасць насення, па вывучэнні і ўжыванні мікраэлементаў у сувязі з вапнаваннем глебы. Арганізатар першага ў СССР гама-поля. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 2 іншымі ордэнамі, медалямі.



Тв.: Вапнаванне глебаў БССР. Мн., 1951; Известкование почв и применение микроэлементов, М., 1957; Основные вопросы известкования дерново-подзолистых почв Советского Союза, М., 1957.

Літ.: Петербургский А. В. Значение работ акад. О. К. Кедрова-Зихмана по проблемам известкования почв и использования микроэлементов. У кн.: Сб. научных трудов по известкованию дерново-подзолистых почв, Мн., 1960; Оскар Карлович Кедров-Зихман. «Агрохимия», 1964, № 2.

КЕДЫШКА Мікалай Аляксандравіч (3.8.1923, Мінск — 7.11.1943), адзін з арганізатараў камсамольска-маладзёжнага падполля ў Мінску ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1965). Увосень 1941 у акупаваным Мінску з групай камсамольцаў стварыў падпольную арг-цыю, якая з крас. 1943 называлася «*Андруша*», і кіраваў ёю. Падтрымліваў сувязь з партызанамі, з 1943 — з Мінскім падпольным гаркомам камсамола, выбраны ў яго склад. Кіраўнік дыверсій на гарадской эл. станцыі, чыг. вузле, хлебазаводзе і інш. Арганізацыя перадала партызанам некалькі аўтаматаў і вінтовак. К. загінуў у час перастрэлкі з фашыстамі. Яго імем названа вуліца ў Мінску, на доме, дзе размяшчаўся штаб арг-цыі, мемарыяльная дошка.



Літ.: Герои Советского Союза — уроженцы Минска и Минской области, Мн., 1965; Николаев Н. Минские молодогвардейцы, Мн., 1968; Люди легенд, в. 3, М., 1968, с. 156—169.

КЕЙДАНСКІ ДАГАВОР 1655, заключаны ў г. Кейданы (Кедайняй) 17.8 і 20.10.1655 паміж вярхамі літ. феадалаў і камандаваннем шведскіх войск пра унію Вял. кн. Літ. з Швецыяй.

Выкарыстаўшы руска-польскую вайну 1654—67 з-за Украіны і Беларусі, Швецыя летам 1655 пачала наступаць на Польшчу і Вял. кн. Літ. і захапіла зах. ч. Літвы. Літ. феадалы на чале з вял. гетманам літ. Янам Радзівілам згадзіліся прызнаць уладу шведаў, пры ўмове захавання іх паліт. ролі ў Вял. кн. Літ. і іх зямельных уладанняў. Барацьба літ. і бел. народаў супраць шведскіх захопнікаў і польска-шведская вайна 1655—60 перашкодзілі ажыццявіць К. д., аднак перагаворы аблегчылі шведам часовую акупацыю тэр. Вял. кн. Літ.

КЕЙНЕМАН (Keuneman) Пітэр (н. 3.10.1917), дзеяч рабочага і камуніст. руху Цэйлона. З сям'і юрыста. Па адукацыі юрыст. Скончыў Кембрыджскі ун-т (Вялікабрытанія). У студэнцкія гады ўключыўся ў маладзёжны камуніст. рух. Вярнуўшыся на Цэйлон, стаў адным з заснавальнікаў кампартыі Цэйлона (КПЦ, 1943). У 1943—50 ген. сакратар ЦК КПЦ, у 1950—55 нам. ген. сакратара, з 1955 ген. сакратар. Чл. Сусв. Савета Міру (з 1950). Дэпутат парламента (з 1947). Пасля перамогі на выбарах у маі 1970 Аб'яднанага фронту, у які ўваходзіць КПЦ, К. стаў міністрам жыллёвага буд-ва і буд. работ. Узначальваў дэлегацыю КПЦ на XXIII з'ездзе КПСС. Удзельнічаў у Маскоўскай нарадзе камуніст. і рабочых партый 1969.

КЕЙНС (Keynes) Джон Мейнард (5.6.1883, Кембрыдж — 21.4.1946), англійскі бурж. эканаміст, ідэолаг дзярж.-манапаліст. капіталізму і імперыял. рэакцыі, заснавальнік кейнсіянства — кірунку ў бурж. паліт. эканоміі перыяду агульнага крызісу капіталізму. Погляды К. найб. поўна выкладзены ў яго кн. «Агульная тэорыя занятасці, працэнта і грошай» (1936). Сцвярджаў, што капіталіст. лад можна захаваць і ўмацаваць дзярж. рэгуля-

ваннем эканомікі, стымуляваннем спажывання, а эканам. крызісы і беспрацоўе можна пераадолець павелічэннем дзярж. выдаткаў (асабліва на ваенныя мэты), рэгуляваннем грашовага абарачэння і інш.

Літ.: Ленін У. І. II канграс Камуністычнага Інтэрнацыянала 19 ліпеня — 7 жніўня 1920 г., Тв., т. 31 (Полн. собр. соч., т. 41); Володин В. С. Кейнс — идеолог монополистического капитала, М., 1953.

КЕЙПТАЎН (Capetown), Кáпстад, горад на ПдЗ Паўд.-Афр. Рэспублікі, каля м. Добрай Надзеі. Адм. ц. Капскай правінцыі. Засн. ў 1652. Важны гандл.-фін. цэнтр краіны. Вял. порт (вываз воўны, фруктаў, скур, кукурузы, алмазаў; прывоз нафтапрадуктаў, лесаматэрыялу, угнаенняў). 625 тыс. ж. (1967). База кітабойных флатылій. Аўтазборачная, лесаапр., шарсцяная, харч. прамысловасць; вагона- і суднабудаванне, суднарамонтныя майстэрні; агранаванне алмазаў. Ун-т, бат. сад, абсерваторыя.

КЕЙСТУТ (г. н. невяд.— п. 1382), князь Вялікага княства Літоўскага, сын *Гедыміна*. Пры жыцці бацькі валодаў Трокамі, Жэмайціяй, Гароднам (Гроднам). У 1345 з братам Альгердам выступіў супраць Яўнуція, які пасля смерці Гедыміна (1341) стаў вял. князем. Прызнаў вял. князем Альгерда, але па сутнасці падзяліў з ім уладу. У беларускалітоўскіх летапісах К., як і Альгерд, называўся вял. князем, у ням. хроніках — каралём. Усё жыццё змагаўся супраць агрэсіі Тэўтонскага ордэна. З Альгердам удзельнічаў у захопніцкіх паходах на Рус. дзяржаву. Пасля смерці Альгерда (1377) прызнаў яго сына Ягайлу вял. князем, аднак у 1381 выгнаў яго з Вільні і захапіў вялікакняскую ўладу. У 1382 схоплены і па загаду Ягайлы задушаны ў Крэўскім замку.

Літ.: Полное собрание русских летописей, т. 17, СПб., 1907; Пашуто В. Т. Образование Литовского государства, М., 1959; Соловьев С. М. История России с древнейших времен, кн. 2 (т. 3—4), М., 1963.

КЕКАНЕН (Kekkonen) Урха Калева (н. 3.9.1900, Піелавесі губ. Куапіо, Фінляндыя), дзяржаўны і паліт. дзеяч Фінляндыі. Д-р юрыд. н. (з 1936). Ганаровы д-р юрыд. н. Маск. ун-та (1958). З 1936 дэп. парламента. У 1936—37 міністр юстыцыі, у 1937—39 міністр унутр. спраў. У 1944 далучаўся да т. зв. мірнай апазіцыі, якая выступала за выхад Фінляндыі з вайны супраць СССР. У 1944—46 міністр юстыцыі. У 1946—47 віцэ-старшыня парламента. У 1950—56 (з перапынкам) прэм'ер-міністр. З 1956 прэзідэнт Фінляндскай рэспублікі. Адзін з заснавальнікаў пасляваеннага міралюбнага курсу Фінляндыі, вядомага пад назвай «лінія Паасіківі — Кеканена».



Тв.: Рус. пер.— Дружба и добрососедство. Речи и выступления. 1963—1967, М., 1968.

КЕКІЛАЎ Аман [н. 26.4(9.5).1912, аул Кешы Ашхабадскага пав. Закаспійскай вобл.], туркменскі савецкі пісьменнік і літ.-знавец. Нар. пісьменнік Туркм. ССР (1967). Акад. АН Туркм. ССР (1969, чл.-кар. з 1959). Д-р філал. н. (1959). Чл. КПСС з 1951. З сялян. Друкуецца з 1926. Найлепшыя вершы пра калектывізацыю, Сав. Армію, на тэмы патрыятызму. Аўтар тэксту Дзярж. гімна Туркм. ССР, паэм «Мае мінулыя дні» (1932), «Наперад» (1935), «Апошняя сустрэча» (1940), «Ад кіпцюроў смерці», «Радзіма», «Вяртанне салдата», «Услаўленне», даследаванняў па тэорыі і гісторыі л-ры («Моланепес», 1957; «Мастацтва слова» і інш.). Раман у вершах «Каханне» (кн. 1—2, 1947—57) пра інтэлігенцыю, патрыятызм і барацьбу сав. людзей у Айч. вайну, пра пасляваен. буд-ва. Дзярж. прэмія Туркм. ССР імя Махтумкулі 1968.



К. Джумаеў. Ашхабад.

КЕЛАВЕПСКІ ВЕК (ЯРУС), келавей, ранні век позняй эпохі (ніжні ярус верхняга аддзела) *юрскага перыяду (сістэмы)*. Вылучаны А. д'Арбіньі ў 1844—46 і названы па мясцовасці Келавей у Англіі. На Беларусі адклады К. я. пашыраны на З і У. Складзены з глінаў, алеўрытаў, пяскоў, а ў верх. ч. разрэзу — з мергеляў і вапнякоў. Магутнасць да 100 *м*. Паводле фаўністычнага аналізу падзяляецца на ніжні, сярэдні і верхні пад'ярусы.

КЕЛДЫШ Мсціслаў Усеваладавіч [н. 28.1(10.2).1911, Рыга], савецкі вучоны ў галіне матэматыкі і механікі. Акад. АН СССР (1946, чл.-кар. 1943), прэзідэнт АН СССР з 1961. Чл. АН многіх краін, ганаровы доктар шэрагу ун-таў. Тройчы Герой Сац. Працы (1956, 1961, 1971). Чл. КПСС з 1949. Скончыў Маск. ун-т (1931). Працаваў у Цэнтр. аэрагідрадынамічным ін-це (1931—46). Адначасова выкладаў у Маск. дзярж. ун-це. У 1934—41 дактарант, ст. навук. супрацоўнік, з 1944 загадчык аддзела механікі, у 1949—51 нам. дырэктара Матэм. ін-та імя Сцяклова. З 1953 дырэктар Аддзялення прыкладной матэматыкі гэтага ін-та (з 1966 Ін-т прыкладной матэматыкі АН СССР). Старшыня К-та па Ленінскіх і Дзярж. прэміях у галіне навукі і тэхнікі пры СМ СССР (з 1961). У галіне матэматыкі фундамент. даследаванні па тэорыі функцый сапр. і комплекснага пераменнага, тэорыі патэнцыялаў, прыбліжаных метадах інтэгравання дыферэнц. ураўн., функцыян. аналізе і інш. Адзін з стваральнікаў



вылічальнай матэматыкі, вылічальнай тэхнікі і пекат. раздзелаў аўтам. кіравання. У галіне аэрагідрадынамікі працы па тэорыі неўстаяванага руху крыла, тэорыі ўдару целаў аб вадкасць, руху целаў пад паверхняй вадкасці, цячэнні газу. Даследаваў ваганні і аўтаваганні авіяц. канструкцый. Зрабіў значны ўклад у развіццё сав. касм. навукі і тэхнікі. На XXII, XXIV з'ездах КПСС выбраны чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета СССР 6—8-га скл. Дзярж. прэміі СССР 1942, 1946, Ленінская прэмія 1958. Узнаг. 6 ордэнамі Леніна, 3 інш. ордэнамі, медалямі.

Літ.: Математика в СССР за сорок лет. Биобиблиогр., т. 2, М., 1959; Математика в СССР. 1958—1967. Биобиблиогр., т. 2, в. 1, М., 1969.

КЕЛЕР Барыс Аляксандравіч [16(28).8.1874, Пецярбург — 29.10.1945], савецкі батанік. Акад. АН СССР (1931), акад. УАСГНІЛ (1935). Чл. КПСС з 1930. Скончыў Казанскі ун-т (1902). Праф. Варонежскіх с.-г. ін-та (1913—31) і ун-та (1919—31). Дырэктар Батанічнага (1931—37) і Глебавага (1931—36) ін-таў АН СССР. У 1937—45 дырэктар Бат. саду АН СССР. Навук. працы па геабатаніцы і экалогіі, анатоміі і фізіялогіі раслін стэпаў, паўпустынь і пустынь. Распрацаваў метад экалагічных радоў, які дае магчымасць высветліць сувязь раслінных асацыяцый з умовамі асяроддзя. Узнаг. 2 ордэнамі Прац. Чырв. Сцяга.



Тв.: Растительный мир русских степей, полупустынь и пустынь, в. 1—2, Воронеж, 1923—1926; Основы эволюции растений, М.— Л., 1948; Избранные сочинения, М., 1951.

Літ.: Липшиц С. Ю. Русские ботаники. Биографо-библиографический словарь, т. 4, М., 1952.

КЕЛЕР (Keller) Готфрыд (19.7.1819, г. Цюрых — 15.7.1890), швейцарскі пісьменнік, пісаў на ням. мове. З сям'і рамесніка. У 1846 выдаў зб. вершаў паліт. характару «Песні самавука». «Зялёны Генрых» (1854—55; 2-я рэд. 1879—80) — класічны раман выхавання. У навелах (зб. «Людзі з Зельдвілы», т. 1—2, 1856—74; «Сем легендаў», 1872; «Цюрыхскія навелы», 1878; «Выслоўе», 1882) рэалістычна паказаў жыццё швейцарскіх сялян, рамеснікаў, бюргераў, стварыў яркую галерэю нар. тыпаў. Асуджаў сквапнасць, крывадушнасць, дух бурж. здзяцтва і нажывы, ханжаства царкоўнікаў (навелы «Тры праведныя грабеншчыкі», «Каваль свайго шчасця» і інш.), процістаўіў ім чысцюю пачуццяў простых людзей, вернасць ідэалам (навелы «Вясковыя Рамэо і Юлія»,



«Сцяг сямі стойкіх» і інш.). Аўтар рамана «Марцін Заландэр» (1886—87) пра развіццё капіталізму ў Швейцарыі і заганы бурж. дэмакратыі.

Тв.: Рус. пер.— Зеленый Генрих, М., 1958; Новеллы, Л., 1970.

Літ.: Готфрид Келлер. Биобиблиогр. указатель, М., 1965.

КЕЛЕРМАН (Kellermann) Бернгард (4.3.1879, г. Фюрт — 17.10.1951), нямецкі пісьменнік. З сям'і чыноўніка. Першыя раманы «Іестэр і Лі» (1904), «Інгебарг» (1906), «Дурань» (1909), «Мора» (1910) напісаны ў рамант. маперы. Асн. тэмы — выкрыццё супярэчнасцей паміж творчай працай, талентам і бурж. цывілізацыяй («Тунель», 1913), асуджэнне мілітарызму, палітыкі ваен. авантур («Дзевятага лістапада», 1920), праблема рэвалюц. перабудовы жыцця («Мюнстэрскія анабаптысты», 1925), рэаліст. адлюстраванне капіталіст. грамадства («Браты Шэленберг», 1925; «Горад Анатоль», 1932). У гады фаш. рэжыму астаўся верны традыцыям крытычнага рэалізму («Блакітная стужка», 1938; і інш.). Вяршыня творчасці К.— раман «Скокі смерці» (1948) пра трагедыю ням. народа пры фаш. дыктатуры. Пасля 1945 К.— актыўны будаўнік новай Германіі. Лаўрэат Нац. прэміі ГДР (1949).



Тв.: Бел. пер.— Шахта «Дзядзька Том», Мн., 1927; рус. пер.— Девятое ноября.— Пляска смерти, М., 1959; Голубая лента, М., 1968.

Літ.: Бергельсон Г. Бернгард Келлерман, М.— Л., 1965.

КЕЛЬВІН Уільям, гл. *Томсан* У.

КЕЛЬТ, стараж. зброя і прылада працы ў выглядзе сякеры ці цяслы, якая ўжывалася для апрацоўкі дрэва і пры земляных работах. Паявіўся ў бронзавым веку (канец 3-га тысячагоддзя да н. э.), у 2—1-м тысячагоддзях да н. э. быў пашыраны ў Еўропе. Пры археал. раскопках на тэр. СССР К. знаходзяць у раёнах Дняпра, сярэдняй Волгі, Прыкам'я, Сібіры, Прыбалтыкі. На тэр. Беларусі характэрны плямёнам *зарубінецкай культуры* (могільнік Чаплін) і *днепра-дзвінскай культуры*. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Бронзавы век*.

КЕЛЬТЫ (Celtae), плямёны індаеўрапейскай групы, якія жылі ў 1-м тысячагоддзі да н. э. ў Зах. Еўропе на Пн і З ад Альпаў. Частка К. называлася *галамі*.

У 9—5 ст. да н. э. адбывалася сац. расслаенне К.; паявілася жалеза. З К. звязана пашырэнне *латэнскай культуры* (каля 5—1 ст. да н. э.). Займаліся земляробствам, ведалі апрацоўку металаў. У час распаду родавых адносін паявілася шырокая праслойка свабодных абшчыннікаў і рабоў. У перыяд найбольшага рассялення займалі тэр. сучаснай Францыі, Швейцарыі, Бельгіі, Паўн. Іспаніі, Брытанскіх а-воў, Паўн. Італіі, басейна Верхняга і Сярэдняга Дуная і інш. Валодалі з германцамі на У, рымлянамі на Пд. У 1 ст. да н. э. завяваваны рымлянамі. Адыгралі пэўную ролю ў фарміраванні англ., франц., бельг. і інш. народнасцей.

Літ.: Филип Я. Кельтская цивилизация и ее наследие, пер. с чеш., Прага, 1961.

КЕ́ЛЬЦКІЯ МО́ВЫ, група моў, якія ўваходзяць у індаеўрапейскую моўную сям'ю. Падзяляецца на тры падгрупы — гаэльскую (гайдэльскую), брыцкую і гальскую.

У гаэльскую ўваходзяць ірландская (эйрэ) — дзярж. мова, побач з англ., Ірландскай рэспублікі (засведчана з 4 ст. т. зв. агамічнымі надпісамі), шатландская (эрская) у горнай частцы Шатландыі (пісьмовыя помнікі з 15 ст.), мова в-ва Мэн у Ірландскім м. (на стадыі вымірання). Гэтыя мовы бяруць пачатак ад гаэльскай мовы. Да брыцкай падгрупы належаць мовы, якія пачынаюцца ад мовы брытаў — насельнікаў Англіі да прыходу англасаксаў: брэтонская на п-ве Брэтань у Францыі (першыя пісьмовыя помнікі з 8—9 ст.), валійская (уэльская, кімрская), на якой гаворыць частка насельніцтва Уэльса ў Зах. Англіі (помнікі з 11 ст.), корнская (карнуольская) на п-ве Корнуал у Англіі (помнікі з 13 ст., вымерла ў 18 ст.). У гальскую падгрупу ўваходзіць гальская мова, некалі пашыраная ў Галіі, у 1 ст. н. э. выцесненая лацінскай.

Літ.: Льюис Г. и Педерсен Х. Краткая сравнительная грамматика кельтских языков, пер. с англ., М., 1954.

КЕМА́ЛЬ Мустафа, гл. *Атацюрк.*

КЕ́МБРЫДЖСКІ УНІВЕРСІТЭ́Т, вышэйшая навуч. ўстанова ў Англіі. Засн. ў 1209 у г. Кембрыджы. У 17 ст. цэнтр перадавой навукі таго часу. З К. у. звязана дзейнасць Ф. Бэкана, Р. Дэкарта, Ч. Дарвіна, Т. Мора, Эразма Ратэрдамскага, І. Ньютана, Дж. Томсана і інш. Ф-ты (1966): стараж. моў і класічнай л-ры, тэалагічны, англ. мовы, сучасных і сярэдневяковых моў, музычны, усходазнаўства, эканомікі і палітыкі, гістарычны, права, маралі і філасофіі, інж. справы, геаграфіі і геалогіі, матэматыкі, фізікі і хіміі, сельскагаспадарчы, археалогіі і антрапалогіі, біялагічны, медыцынскі, педагагічны; больш за 10 тыс. студэнтаў. Музей, маст. галерэя, б-ка. К. у.— недаступная народу навуч. ўстанова, плата за навучанне высокая.

КЕМБРЫ́ЙСКІ ПЕРЫ́ЯД (СІСТЭ́МА), кембрый (ад старой назвы Уэльса Cambria у Вялікабрытаніі), першы перыяд *палеазойскай эры* ў гісторыі Зямлі. Пачаўся 570 млн. гадоў назад, цягнуўся 70 млн. гадоў. Вылучаны англ. геолагам А. Седжвікам. Падзял. на аддзелы — ніжні, сярэдні, верхні. У СССР у ніжнім аддзеле вылучаюць алданскі і ленскі ярусы, у сярэднім — амгінскі і майскі.

Асн. структурныя элементы зямной кары — платформы (Усх.-Еўрапейская, Сібірская, Бразільская і інш.), якія сфарміраваліся да пачатку К. п., у раннім кембрыі былі пераважна сушай, а ў сярэднім на значнай плошчы ўкрыліся морам. У геасінкліналях паміж платформамі намнажаліся магутныя тоўшчы марскіх асадкаў. У сярэднім і верхнім кембрыі адбылася *салаірская складкавасць*, у выніку якой утварыўся шэраг горных збудаванняў на Пд ад Сібірскай платформы і ў паўд. Еўропе. У морах К. п. жылі разнастайныя арганізмы — водарасці, археацыяты, трылабіты, прымітыўныя брахіяподы, птэраподы, чэрві. З'явіліся прасцейшыя наземныя споравыя расліны. Асабліва пашыраныя і разнастайныя былі трылабіты. Побач з абласцямі сухога і гарачага ці цёплага клімату (Сібір, Індыя) былі вобласці абледзянення (Скандынавія, Кітай, Аўстралія). Адклады К. с. пашыраны ў СССР, Еўропе, Паўн. Амерыцы, Азіі, Паўн. Афрыцы, Аўстраліі. Складзены на платформах з карбанатных і глініста-карбанатных, радзей з абломкавых парод, у геасінкліналях — з абломкавых, карбанатных, крамянёвых і вулканагенных парод. Адклады К. с. змяшчаюць радовішчы каменнай солі, гіпсу, рудаў жалеза і марганцу, баксітаў, фасфарытаў, гаручых сланцаў, нафты і інш.

На Беларусі адклады К. с. пашыраны ў паўд.-зах. і паўн.-зах. раёнах. Вылучаюць ніжні і сярэдні аддзелы. Магутнасць ад некалькіх дзесяткаў да 400 *м*. Складзены з глінаў, алеўралітаў і пясчанікаў.

Літ.: Стратиграфия СССР. Кембрийская система, М., 1965; Махнач А. С. Кембрийский период, у кн.: Геология СССР, т. 3 — Белорусская ССР, М., 1971. *А. С. Махнач.* Мінск.

КЕМЕ́ЛІШКІ, вёска ў Астравецкім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Кемелішкі». За 70 *км* на Пн ад Астраўца, 320 *км* ад Гродна, 25 *км* ад чыг. ст. Пабрадзе (Літ. ССР); злучана з аўтамаб. дарогай Паставы — Вільнюс. 521 ж., 189 гасп. (1971). Лясніцтва, атэлье камбіната быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, аддз. сувязі, сталовая, 4 магазіны. Брацкая магіла 350 сав. грамадзян, расстраляных ням.-фаш. захопнікамі ў 1943.

КЕ́МЕРАВА (да 1932 Шчаглоўск), горад, цэнтр Кемераўскай вобл. РСФСР, на р. Том. Утвораны ў 1918 з в. Шчаглова і Кемерава. Чыг. станцыя, аэрапорт. 393 тыс. ж. (1971). Прамысл. і культ. цэнтр Кузбаса. Хім., вугальная, машынабуд., харч., энергетычная прамысловасць. Найб. прадпрыемствы: хімкамбінат; азотнатукавы, анілінафарбавы, коксахімічны, штучнага валакна, электрамеханічны, электратэхнічны, буд. машын, хім. машынабудавання з-ды. Камбінаты шаўковых тканін і мясакансервавы. Ін-ты: політэхнічны, пед., мед., культуры; філіял Усесаюзнага завочнага фін.-эканам. ін-та. 10 сярэдніх спец. навуч. устаноў. 3 тэатры (драм., аперэты, лялечны), карцінная галерэя. Краязнаўчы музей.

КЕ́МЕРАЎСКАЯ ВО́БЛАСЦЬ, у складзе РСФСР. Утворана 26.1.1943. Размешчана на ПдУ Зах. Сібіры. Пл. 95,5 тыс. *км*². Нас. 2909 тыс. чал. (1971). Падзял. на 16 раёнаў; 19 гарадоў, 42 гар. пас. Цэнтр. г. Кемерава.

Большая частка тэр. занята Кузнецкай катлавінай; на ПнУ і У Кузнецкі Алатау выш. да 2178 *м*, на З Салаірскі краж выш. да 590 *м*. Паверхня ўзгорыстая, на Пн раўнінная (частка Заходне-Сібірскай раўніны). На Пд сярэдневышынныя горы Горнай Шорыі. Карысныя выкапні: кам. вугаль, жал. руда, поліметалічныя руды, марганец, баксіты, золата, фасфарыты. Клімат кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. −17, −20, ліп. 17—20 °С. Ападкаў ад 300 *мм* на ПнЗ да 500 *мм* на Пд. Вегет. перыяд 137—145 дзён. Рэкі належаць да бас. р. Об; найб. Том (з прытокамі Мрас-Су, Кондама), Кія, Яя, Іня, Чумыш. Рэкі багатыя на гідраэнергію. Глебы на раўніне і ў Кузнецкай катлавіне чарназёмныя, у перадгорнай і горнай частках падзолістыя і шэрыя лясныя. Пад лесам 70% тэр., пераважаюць хвойныя (піхта, кедр, хвоя, елка, лістоўніца), з лісцевых бяроза і асіна. Асн. насельніцтва рускія; жывуць украінцы, татары, чувашы, беларусы. Сярэдняя шчыльн. 30,5 чал. на 1 *км*². Гарадскога нас. 83%. Найб. гарады: Новакузнецк, Кемерава, Пракоп'еўск, Ленінск-Кузнецкі, Кісялёўск, Анжэра-Суджанск, Бялова.

Асн. галіны прамысловасці: вугальная, металургічная, хім., машынабудаўнічая. У 1970 здабыта 120 млн. *т* кам. вугалю. Гал. цэнтры Пракоп'еўск, Кісялёўск, Ленінск-Кузнецкі, Асіннікі, Бялова, Новакузнецк, Анжэра-Суджанск, Кемерава. Здабываюць буры вугаль. Энергетычная база прамысловасці — ЦЭС, найб. Кемераўская, Новакемераўская, Кузнецкая; Бялоўская і Том-Усінская ДРЭС. Вытворчасць чорных і каляровых металаў. У Новакузнецку 2 металург. камбінаты і з-д ферасплаваў, у Гур'еўску металург. з-д няпоўнага цыкла. Каляровая металургія (алюмініевы з-д у Новакузнецку, цынкавы ў Бялове). У Горнай Шорыі, Кузнецкім Алатау і Салаірскім кражы здабыча золата. Прамысловасць коксахімічная (Кемерава, Новакузнецк), азотнатукавая і вытворчасць анілінавых фарбавальнікаў (Кемерава), хім.-фармацэўтычная (Анжэра-Суджанск, Кемерава). Машынабудаванне (машыны і абсталяванне для вугальнай і горнаруднай прамысловасці) у Анжэра-Суджанску, Кісялёўску, Пракоп'еўску. Электратэхн. прамысловасць і вытворчасць абсталявання для хім. прамысловасці (Кемерава). Прамысловасць буд. м. (вытворчасць цэменту ў Яшкіне, Новакузнецку, шыферу ў Яшкіне, шкла ў Анжэра-Суджанску, зборных жалезабетонных канструкцый і дэталяў у Новакузнецку). Прадпрыемствы лесахімічнай, дрэваапр., лёгкай і харч. прамысловасці. С. гасп. спецыялізуецца на вырошчванні збожжа, бульбы і на жывёлагадоўлі. На 1.1.1971 у К. в. 66 калгасаў і 123 саўгасы. Пасяўная пл. (тыс. *га*, 1970) 1543,7, у т. л. пад збожжавымі 949,4, кармавымі 487,6, бульбай 91,8, агароднінай 14,4. Асн. збожжавыя культуры (тыс. *га*) пшаніца (535,1), ячмень (196,7) і авёс (137,7). Жывёлагадоўля малочна-мяснога кірунку. На пач. 1971 (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 715,7 (у т. л. кароў 318,9), свіней 595,9, авечак і коз 213,2. Пчалярства, пушны промысел і зверагадоўля. Даўж. чыгунак 1692 *км*. Аўтамаб. дарог 11 235 *км*, у т. л. з цвёрдым пакрыццём 2228 *км*. Суднаходства па Томі і Кіі. 6 ВНУ, 50 сярэдніх спец. навуч. устаноў. 5 т-раў, 3 музеі. Абл. газ. «Кузбасс».

Літ.: Герасимова Н., Матырев А. и Савельева Л. Экономическая география Кемеровской области, Кемерово, 1964; Кемеровская орденоносная, Кемерово, 1968. *А. С. Акінчыц.* Мінск.

КЕ́МЕРЫ, бальнеалагічны курорт у Латв. ССР, за 44 *км* ад Рыгі, 5 *км* ад Рыжскага зал.

Зіма мяккая, лета ўмерана цёплае. Сярэдняя т-ра студз. −4 °С, ліп. 17 °С. Сонечна 1750—1800 гадзін у год. Лячэбныя фактары: мінер. крыніцы (на ванны сульфатна-кальцыева-магніевыя і серавадародныя, пітныя — хларыдна-сульфатна-натрыева-кальцыевыя) і лекавыя гразі (тарфяная і сапрапелевая). Функцыянуюць (1970) 7 санаторыяў для дарослых, 2 дзіцячыя і агульнакурортная водагразелячэбніца. Лечаць хваробы органаў руху, гінекалагічныя, сардэчна-сасудзістай і нервовай сістэм, гіпаацыдныя гастрыты. Сезон — увесь год.

Літ.: Золотов В. А. Кемери, Рига, 1959; Здравницы профсоюзов СССР, 3 изд., М., 1967.

КЕ́МПЕ Мірдза Янаўна [н. 27.12.1906 (9.1.1907), Лібава], латышская савецкая паэтэса. Нар. паэтэса Латв. ССР (1967). Вучылася на эканам. ф-це Латв. ун-та (1927—28), працавала на Рыжскім радыё перакладчыцай. Першыя вершы апубл. ў 1923. Аўтар. зб.: «На ранішнім ветры» (1946), «За мір і жыццё» (1951), «Вершы» (1955), «Каханне» (1957), «Я не магу маўчаць» (1959), «Шалёнае полымя» (1961), «Вечнасць імгненняў» (1964), «Святло ў камені» (1967), «Янтарнае люстэрка» (1968), «Шлях чалавека» (1969) і інш. Вершы К. вызначаюцца філас. глыбінёй, высокай паэт. культурай. Дзярж. прэмія СССР 1967.

Тв.: Бел. пер.— у кн.: Ветрык, вей!, Мн., 1959; рус. пер.— Стихотворения, Л., 1952; Стихи, М., 1955; Вечность мгновений, М., 1969.

Літ.: История латышской литературы, т. 2, Рига, 1971. *А. Я. Вілсан.* Рыга.

КЕНГУРУ́ (Macropodidae), сямейства млекакормячых атр. *сумчатых*. 46 відаў. Пашыраны ў Аўстраліі, на Новай Гвінеі, у Тасманіі.

Даўж. цела ад 25 *см* да 3 *м*, хваста 35—90 *см*. Пярэднія ногі пяціпальцыя, маленькія; заднія — чатырохпальцыя, вялікія, моцныя. Галава малая. Жывуць К. ў стэпах, гарах. Перамяшчаюцца скачкамі. Ёсць віды, якія лазяць па дрэвах. Траваедныя. Дзіцяняты нараджаюцца недаразвітыя і 6—



Гіганцкі кенгуру.

8 месяцаў даношваюцца ў вывадковай сумцы на жываце ў самкі. Некат. К. аб'ект промыслу. Найб. вядомы гіганцкі К. (Macropus giganteus).

КЕНЕВІЧ Баляслаў Альбінавіч [8(21).11.1907, в. Дварэц Пінскага пав. Мінскай губ.— 3.5.1969], генерал-лейтэнант (1946). З сялян. Чл. КПСС з 1931. Скончыў Вышэйшыя акадэм. курсы (1948). Удзельнік вызвалення Зах. Беларусі (1939), сав.-фінляндскай вайны 1939—40. У Айч. вайну на Зах., Паўн.-Зах., 1-м Бел. франтах — камандзір стралк. палка, дывізіі. Удзельнік баёў пад Масквой, вызвалення Варшавы, Вісла-Одэрскай, Берлінскай аперацый. У 1945—54 у Сав. Арміі на адказных пасадах. З лют. 1954 у запасе. Узнаг. 9 ордэнамі, медалямі, 7 ордэнамі ПНР.



КЕНЖЫБАЕЎ Цюле (н. 1902, Верненскі пав. Сямірэчанскай вобл.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). На фронце з 1943. Вызначыўся ў Камарынскім р-не Палескай вобл. 28.9.1943 двойчы пераправіў на плыце цераз Дняпро сав. воінаў. 30.9.1943 у баях за плацдарм і в. Галкі знішчыў варожы дэсант. Жыве ў калгасе «Авангард» Чылікскага р-на Алма-Аціпскай вобл.

КЕНІЯ (Кепуа), Рэспубліка Кенія, дзяржава ў Усх. Афрыцы. Уваходзіць у склад Садружнасці на чале з Вялікабрытаніяй. Пл. 582,6 тыс. км². Нас. 10,9 млн. чал. (1970). Падзяляецца на 7 правінцый і сталічную акругу. Сталіца Найробі. Дзейнічае канстытуцыя 1963. На чале дзяржавы і ўрада прэзідэнт, які выбіраецца на 5 гадоў. Заканадаўчы орган — Нац. асамблея. Орган выканаўчай улады — кабінет міністраў, які фарміруецца прэзідэнтам.



Прырода. Большую ч. краіны займае пласкагор'е выш. ад 500 м на У да 2000—3000 м над узр. м. на З. На захадзе пласкагор'е перасякаецца глыбокай скідавай упадзінай, па краях якой патухлыя вулканы Кенія (5199 м), Элган (4322 м, на граніцы з Угандай) і інш. Карысныя выкапні: спажыўная соль, кіяніт, дыятаміт, вугленатрыевая соль, золата, азбест, графіт, каалін. Клімат экватарыяльна-мусонны. Сярэдняя т-ра самага цёплага месяца (сак.) 18—28, самага халоднага (ліп.) 14—24 °С. Колькасць ападкаў (250—1500 мм) павялічваецца з ПнУ на ПдЗ; 2 сезоны дажджоў (сак.— май, кастр.— снежань). Пастаянных рэк мала. Бяссцёкавыя азёры Рудольф, Варынга і інш.; на ПдЗ — Вікторыя. На Пн і ПнУ на бурых глебах паўпустыні, на Пд і ПдЗ апустыненая саванна на чырвона-бурых глебах; на ўзвышшах аніяна мангравыя лясы; па далінах рэк вільготныя трапічныя лясы; высока ў гарах субальпійскія лугі. Жывёльны свет: слон, насарог, буйвал, антылопа, жырафа, леў, страус, у рэках бегемот і кракадзілы. У К. 8 нац. паркаў (больш за 22 тыс. км²) і 8 запаведнікаў (6820 км²).

Насельніцтва. Каля 98% — афрыканцы, якія гавораць на мовах банту (кікуйю, камба і інш.), нілоцкай, кушыцкай. У гарадах жывуць індыйцы, арабы, еўрапейцы. Дзярж. мовы — англійская і суахілі. Найб. шчыльнасць на Пд ад экватара. Каля 75% веруючых вызнаюць мясцовыя традыц. вераванні, астатнія — хрысціянства, іслам, індуізм. Гар. нас. 8,5%. Найб. гарады (тыс. ж., 1969): Найробі (478), Мамбаса (246), Накуру, Кісуму.

Гістарычная даведка. Археал. раскопкі выявілі сляды дзейнасці старажыт. чалавека на тэр. К. з эпохі палеаліту. У старажытнасці ўзбярэжжа сучаснай К. наведвалі грэч., егіп., кітайскія, індыйскія, арабскія мараплаўцы і купцы. У 7—8 ст. К.— раён інтэнсіўнай араб. каланізацыі. З канца 15 ст. паміж партугальцамі і арабамі ішла ўпартая барацьба за панаванне ў краіне. У 16 — пач. 18 ст. большая частка К. пад кантролем Партугаліі. У 18 — пач. 19 ст. тут існавала некалькі араб. султанатаў. З канца 19 ст. за Усх. Афрыку змагаліся Германія і Англія. У 1895 К. ўвайшла ў склад Брыт. Усходнеафр. пратэктарату, з 1897 — уласнасць брыт. кароны. У 1920 абвешчана калоніяй. У К. усталявалася жорсткая сістэма калан. прыгнёту. Арганізаваны антыкалан. рух пачаўся пасля 1-й сусв. вайны. Барацьбу за зямлю, дэмакр. свабоды і адмену расавай дыскрымінацыі ўзначаліла першая масавая афр. паліт. арг-цыя Саюз афрыканцаў К. (КАУ; засн. ў 1944). У кастр. 1952 калан. ўлады ўвялі ў К. надзвычайнае становішча, забаранілі ўсе прагрэс. арг-цыі і прафсаюзы. Кіраўнікі КАУ на чале з Дж. Кеньята арыштаваны. У краіне пачалося ўзбр. паўстанне, якое было жорстка задушана Англіяй (1956). У студз. 1960 пад націскам антыкалан. руху надзвычайнае становішча скасавана. Масавая паліт. арг-цыя Нац. саюз афрыканцаў К. (КАНУ; засн. ў 1960) патрабавала даць краіне незалежнасць. У 1963 КАНУ атрымала перамогу на першых усеагульных выбарах у Нац. сход і сфарміравала першы афр. ўрад на чале з Кеньята (лідэр з 1961; перавыбраны на пасаду прэзідэнта ў 1969). 1.6.1963 К. атрымала ўнутранае самакіраванне, 12.12.1963 — незалежнасць, 12.12.1964 абвешчана рэспублікай. Дыпламат. адносіны з СССР устаноўлены ў снеж. 1963, у 1966 падпісана пагадненне пра эканам. і тэхн. супрацоўніцтва. У сак. 1966 група левых лідэраў КАНУ і членаў урада стварыла новую паліт. арг-цыю Саюз народаў К. (КПУ; забаронена ў 1969). Чл. ААН з 1963.

Гаспадарка. Ключавыя пазіцыі ў эканоміцы, асабліва ў прамысловасці, знешнім гандлі і фінансах належаць замежнаму, пераважна англ., капіталу. Самая важная галіна эканомікі — с. гасп., дзе пераважае земляробства. Асн. экспартныя культуры вырошчваюцца на плантацыях, якія належаць еўрапейцам. Новы план развіцця (1970—74) прадугледжвае павялічыць ролю прыватнага нац. капіталу.

Найробі. Харамбе авеню — галоўная вуліца сталіцы.




КЕНІЯ
Маштаб 1:11 000 000
110 0 110 220 км
Найробі
Мамбаса
Кісуму
Накуру
Эльдарэт
Нарок
Кітуі
Кіліфі
Малінді
Лаўра
Ламу
Ваджыр
Марсабіт
Гарыса
Кольва
Ісіёла
Мерту
Муга-Гашы
Алі-Габа
Ваір
Ньякі
Мбалам-бала
Сава
Эль-Дэйн
Гранд-Фолс
Квангвада
Камуды
Каша
Бура
Рыгмёо
Кіміч
Кіпіні
Хашыма-Мдоці
Мдоці
Мтыта-Андэй
Ош-Тукаі
Цава
Галана
Воі
Бамба
Марыякані
Квале
Гонджа
Самбуру
Кітуі
Кіцуі
Кіліма-Мбогу
Кіліма-Мбогу
Кіліма-Мбогу

Большасць тэр. займае вапняковае Апалачскае плато выш. 200—500 м, парэзанае глыбокімі далінамі рэк Камберленд, Грын-Рывер і Кентукі. На З ускраіна раўніны р. Місісіпі. Развіты карст. У К. адна з найб. пячор свету — Мамантава (225 км). Карысныя выкапні: кам. вугаль, нафта, прыродны газ, плавіковы шпат, асфальт. Клімат умераны, вільготны. К.— індустр.-агр. штат. Аснова гасп.— апрацоўчая прамысловасць. Эл.-тэхн., машынабудаўнічая (вытворчасць прамысл. і с.-г. машын, абсталявання), хім., харч. (асабліва кансервавая) і тытунёвая прамысловасць. Важны цэнтр ат. прамысл. ЗША — г. Падзьюка. Вырошчваюць тытунь (2-е месца ў ЗША), кукурузу, соевы боб. Гадуюць буйн. раг. жывёлу, свіней, авечак. Транспарт чыг. і аўтамаб. Суднаходства па р. Агайо.

КЕНЭ (Quesnay) Франсуа (4.6.1694, Мерэ каля Парыжа — 16.12.1774), французскі эканаміст, прадстаўнік школы фізіякратаў. К. Маркс лічыў К. адным з заснавальнікаў паліт. эканоміі (гл. Капітал, т. 1, Мн., 1952, с. 321). У творы «Эканамічная табліца» (1758) зрабіў першую спробу прааналізаваць працэс грамадскага ўзнаўлення. Выступіўшы супраць меркантылістаў, сцвярджаў, што прыбавачная вартасць ствараецца не ў сферы абарачэння, а ў сферы вытворчасці. Аднак адзінай прадукцыйнай галіной, дзе ствараецца прыбавачная вартасць («чысты прадукт»), лічыў с. гасп., сам «чысты прадукт», на яго думку,— падарунак прыроды. Ідэалізаваў капіталіст. фермерства.

Тв.: Рус. пер.— Избр. экономические произв., М., 1960.

Літ.: Маркс К. Капітал, т. 1—2, Мн., 1952; Энгельс Ф. Анты-Дзюрынг, Мн., 1952.

КЕНЭДЗІ (Kennedy) Джон Фіцджэралд (29.5.1917, Бруклайн — 22.11.1963), паліт і дзярж. дзеяч ЗША. З сям'і мільянера (бацька займаў пасады ва ўрадзе Ф. Д. Рузвельта, у 1937—40 пасол ЗША ў Вялікабрытаніі). Скончыў Гарвардскі ун-т (1940). У 2-ю сусв. вайну афіцэр ваенна-марскіх сіл. Пасля вайны журналіст. Чл. палаты прадстаўнікоў (1947—52) Канграсу ЗША. У 1952 выбраны ў сенат, у 1960 — прэзідэнтам ЗША. Ва ўнутр. палітыцы трымаўся канцэпцыі «новых рубяжоў», накіраванай на ўмацаванне пазіцый амер. манапаліст. капіталізму. Рэальна ацэньваў новыя абставіны на сусв. арэне, імкнуўся вырашаць складаныя міжнар. праблемы праз перагаворы, абмежаваць расавую дыскрымінацыю негрыцянскага насельніцтва ЗША. Такая пазіцыя выклікала рэзкія нападкі з боку крайняй рэакцыі. Забіты ў г. Далас у час паездкі па краіне.



Літ.: Громыко А. А. 1036 дней президента Кеннеди, М., 1968; Манчестер У. Убийство президента Кеннеди, пер. с англ., М., 1969; Яковлев Н. Н. Преступившие грань, М., 1971.

КЕНЭДЗІ (Kennedy) Роберт Фрэнсіс (20.11.1925, Бостан — 6.6.1968), паліт. і дзярж. дзеяч ЗША. Брат забітага (1963) прэзідэнта ЗША Дж. *Кенэдзі*. Скончыў Гарвардскі (1948) і Віргінскі (1951) ун-ты. Бакалаўр права. Працаваў у адвакатуры, юрысконсультам у камісіях сената. Кіраваў кампаніяй па выбранні Дж. Кенэдзі прэзідэнтам ЗША. У 1961—64 міністр юстыцыі. З 1964 сенатар. Адзін з магчымых кандыдатаў на пасаду прэзідэнта ЗША на выбарах 1968. Выступаў з крытыкай унутр. і знешняй палітыкі ўрада Л. Джонсана. Забіты ў Лос-Анджэлесе, дзе выступаў з перадвыбарнай прамовай.

КЕПЛЕР (Kepler) Іаган (27.12.1571, Вейльдэр-Штат, Пд Германіі — 15.11.1630), нямецкі астраном. Скончыў Цюбінгенскі ун-т (1593). Адкрыў (1609—19) законы руху планет (гл. *Кеплера законы*). Распрацаваў тэорыю сонечных і месячных зацьменняў, склаў першыя табліцы для вылічэння месцазнаходжання планет. Адкрыў закон змяншэння інтэнсіўнасці святла з адлегласцю. Прапанаваў канструкцыю зрокавай трубы для астр. назіранняў. У матэм. працах (стэрэаметрычныя задачы) блізка падышоў да адкрыцця аналізу бесканечна малых. Працы К. вядомыя на Беларусі з 17 ст.; яны абмяркоўваюцца ў многіх філас. рукапісах (напр., у курсе К. *Нарбута* і ў творах прадстаўнікоў *Астранамічнай школы*).



Літ.: Баев К. Л. Создатели новой астрономии. Коперник. Бруно. Кеплер. Галилей, М., 1955.

КЕПЛЕРА ЗАКОНЫ, тры законы руху нябесных целаў: 1) кожная планета рухаецца па эліпсе, у адным з фокусаў якога знаходзіцца Сонца; 2) закон плошчаў: радыус-вектар, праведзены ад Сонца да планеты, у роўныя прамежкі часу апісвае роўныя плошчы (гл. рыс.: $S_1=S_2$); 3) квадраты перыядаў абарачэнняў планет вакол Сонца адносяцца як кубы іх сярэдніх адлегласцей ад Сонца. Выведзены І. *Кеплерам* на аснове звестак дацкага астранома Т. Браге (1546—1601) паводле назіранняў бачнага руху планет. К. з. спрыялі адкрыццю І. Ньютанам *сусветнага прыцягнення закону*, на аснове якога яны былі абагульнены і ўдакладнены. К. з. ў форме Ньютана карыст. пры знаходжанні масы планет, разліку арбіт спадарожнікаў і інш. Гл. таксама *Нябесная механіка*.



Літ.: Блажко С. Н. Курс общей астрономии, М.— Л., 1947; Демин В. Г. Судьба солнечной системы, М., 1969.

КЕРА З'ЯВА, *падвойнае праменепераламленне* святла ў ізатропным асяроддзі (вадкасці, газе або шкле) пры дзеянні вонкавага эл. поля. Выяўлена шатл. вучоным Дж. Керам у 1875.

Вонкавае эл. поле часткова арыентуе малекулы асяроддзя, і яно набывае аптычныя ўласцівасці адпаводнага крышталю, вось якога паралельная кірунку поля. Паказчыкі пераламлення святла, паляризаванага ў плоскасці, паралельнай ($n^{\parallel}$) і перпендыкулярнай ($n^{\perp}$) кірунку поля, маюць розныя значэнні. Пры гэтым $n^{\parallel}-n^{\perp}=\lambda BE^2$ (закон Кера), дзе λ — даўжыня хвалі святла, B — пастаянная Кера, E — напружанасць эл. поля. К. з. выкарыстоўваецца ў эл.-аптычных засаўках для лавераў і мадулятарах святла (ячэйка Кера). К. з. ўлічваецца ў таксама ад дзеяння эл. поля магутнага светлавога (лазернага) выпрамянення.

Літ.: Дитчберн Р. Физическая оптика, пер. с англ., М., 1965. *Б. В. Бойка.* Мінск.

КЕРАМЗІТ (грэч. *kéramos* гліна), успучаны порысты будаўнічы матэрыял у выглядзе жвіру ці шчэбеню, які вырабляецца паскоранай абпальваннем лёгкаплаўкіх глінаў.

Ужываецца як запаўняльнік для атрымання цеплаізаляцыйных і лёгкіх бетонаў у агараджальных і насычых элементах буд. канструкцый. Аб'ёмная маса жвіру з К. 250—1000 *кг/м*³. На Беларусі К. розных марак вырабляе Віцебскі камбінат буд. матэрыялаў.

КЕРАМІКА мастацкая (грэч. *keramikē* ганчарнае мастацтва ад *kéramos* гліна), вырабы з прыродных глінаў і іх сумесей з мінер. і арган. дамешкамі, абпаленыя да камененадобнага стану; галіна дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Асн. тэхнал. віды мастацкай К. — *тэракота*, шамот, *маёлiка*, *фаянс*, каменная маса, *фарфор*.

Посуд, фігуркі людзей і жывёл з абпаленай гліны вядомыя з *неаліту*. Удасканаленне спосабаў атрымання вырабаў з гліны (ад лепкі ўручную да фармоўкі на ганчарным кругу), іх абпальвання (ад вогнішча да ганчарнага горна) і аздабленняў (ад нескладанага ямкавага арнаменту да глянцавання, лакаў, ангоба, палівы і шматкаляровага роспісу) шматлічвала выразныя магчымасці К. (гл. *Ганчарства*). Імкнучыся атрымаць тонкую і прыгожую К., майстры розных эпох і краін прыходзілі да адных і тых жа адкрыццяў. Напр., вытворчасць фаянсу і глазураў, вядомая стараж. егіпцянам у 15 ст. да н. э., была зноў вынайдзена ў 3—4 ст. н. э. ў Кітаі, у 9—10 ст. у краінах Б. Усходу, у 16 ст. ў Францыі. Сакрэт фарфору, вядомага ў Кітаі з 6—7 ст., адкрылі ў 1-й пал. 18 ст. самастойна рус. і інш. майстры. У Францыі і Англіі створаны блізкія да фарфору разнавіднасці К.— т. зв. мяккі і «касцяны» фарфор. У гісторыі К. выдатнае месца займаюць стараж.-грэч. роспісныя вазы (гл. *Ваза, Вазапіс*) і тэракотавыя статуэткі, кітайскі фарфор 1—17 ст., блізкаўсходні паліхромны з люстрам посуд і арх. абліцоўкі 9—13 ст. (у т. л. помнікі Самарканда і Бухары), іспана-маўрытанская (14—15 ст.) і італьянская (15—17 ст.) маёліка, фаянсы Рувана, Сеўра (16—18 ст.), фарфор Мейсена (18 ст.). У СССР побач з масавым посудам і дробнай пластыкай мастакі, апіраючыся на вопыт нар. прамыслаў (Гжэль, Скапін, Апошня), ствараюць унікальныя вырабы з фарфору, тэракоты, маёлікі, шамату і інш.

Першыя знаходкі керамічных вырабаў на тэр. Беларусі адносяцца да эпохі неаліту (хеплены ўручную посуд з гравіраваным грабеньчата-ямкавым і інш. арнаментам). У час бронзы пашыраецца шнуравая К., у жал. век пераважае штрыхаваная, гладкасценная і чорнагляцавая. Вырабляліся таксама праслідзі, грузілы і інш. З 10 ст. выкарыстоўваецца ганчарны круг, на дне посуду ставяцца клеймы. Гаршкі, міскі, гарлачы, збанкі часта аздабляюцца гравіраваным лінейна-хвалістым узорам, штрыхамі і кропкамі. У 12 ст. ўжываецца паліва. Вырабляюцца рознакаляровыя арх. дэталі, абліцовачныя плітачкі, імі аздабляюцца цэрквы (гл. *Гродзенская Нiжняя царква*). У 16—17 ст. на Беларусі развіваецца вытворчасць *кафлі* ў Копысі (Аршанскі р-н Віцебскай вобл.; гл. *Копыская кафля*), у 18 — пач. 19 ст.— выраб фаянсу ў Целяханах (Івацэвіцкі р-н Брэсцкай вобл.). Фаянсавы посуд — кубкі, вазы, паласкальніцы, соуснікі, чарніліцы і інш. аздабляліся рэльефным арнаментам, маскаронамі, шматколерным роспісам і пазалотаю. У 19 ст. побач з хатняй вытворчасцю існавалі саматужная і фабрычная (гл. *Івянецкая кераміка*). Асобная галіна нар. К.— гліняная скульптура, цацкі-свістулькі (конікі, пеўнікі, качкі, медзведзяняты), дэкар. посуд у выглядзе мядзведзяў, соваў, бараноў, чарніліцы і попельніцы з ляпнінаю. У сав. час на базе нар. ганчарнай справы створана некалькі арцеляў (у т. л. «Чырвоны Кастрычнік» у Барысаве). З 1948 працуе Мінскі фарфоравы з-д. У стварэнні першых узораў бел. маст. керамікі ўдзельнічаў М. Міхалап. Сярод бел. мастакоў-керамістаў: Т. Багданава, М. Бяляеў, В. Гаўрылаў, Ф. Зільберт, В. Кірыленка, У. Кузняцоў, В. Леантовіч, Л. Панамарэнка, Т. Паражняк, М. Шаўцова і інш. Гл. таксама *Мастацкая прамысловасць*.

Іл. гл. на ўкл. да гэтага арт. і ў арт. *Археалогія, Бронзавы век, Ганчарства, Днепра-дзвінская культура, Зарубінецкая культура, Івянецкая кераміка, Каменны век, Кафля, Копыская кафля, Мілаградская культура, Паморская культура, Фарфор, Фаянс, Штрыхаваная керамікі культура.*

Літ.: Загорульский Э. М. Археология Белоруссии, Мн., 1965; Очерки по археологии Белоруссии, ч. 1, Мн., 1970; Салтыков А. Б. Русская керамика, М., 1952; Яго ж. Самое близкое искусство, М., 1969; Хохлова Е. Н. Современная керамика и народное гончарство, М., 1969; Елатомцева И. М. Художественная керамика Советской Белоруссии, Мн., 1966; гл. таксама пры арт. *Кафля*.

І. М. Алатамцава (бел. кераміка). Мінск.

КЕРАНСКІ Аляксандр Фёдаравіч [10(22).4.1881, Сімбірск — 11.6.1970], рускі бурж. паліт. дзеяч. З дваран. Чл. партыі эсэраў. Скончыў Пецярбургскі ун-т (1904). Адвакат. Чл. 4-й Дзярж. думы, старшыня фракцыі трудавікоў. У 1-ю сусв. вайну сацыял-шавініст. У перыяд Лют. рэвалюцыі чл. і таварыш старшыні выканкома Петраградскага Савета, чл. Часовага к-та Дзярж. думы. У *Часовым урадзе* — міністр юстыцыі, потым ваен. і марскі міністр, з 8(21).7.1917 міністр-старшыня. Пасля разгрому *карнілаўшчыны* вярх. галоўнакамандуючы. Праводзіў антынар. палітыку, накіраваную на працяг імперыял. вайны, задушэнне рэвалюцыі, захаванне ўлады буржуазіі і памешчыкаў. У час Кастр. рэвалюцыі ў Петраградзе ўзначаліў мяцеж Краснова супраць Сав. улады. З 1918 у эміграцыі (Францыя, з 1940 ЗША). Да СССР ставіўся варожа.

Літ.: Ленін У. І. Тв. [гл. Даведачны т., ч. 2 (Справочный т. к Полн. собр. соч., ч. 2)]; Сверчков Д. Ф. Керенский, 2 изд., Л., 1927.

КЕРАТАФІР, горная парода, адносна багатая на натр. Палеатыпны эфузіўны або субвулканічны аналаг *сіенітаў*.

Складзены з шчолачнага палявога шпату (альбіту, врадку анартаклазу) з прымессю біятыту, амфіболу, піраксену, часцей ператвораных у хларыт. Структура парфіравая. Колер буры ці ружаваты. На Беларусі трапляецца на ПдУ ў комплексе вулканічных парод дэвонскага асадкавага чахла.

КЕРАЦІНЫ (грэч. *kéras* рог), серазмяшчальныя бялковыя рэчывы, у саставе якіх ёсць амінакіслата цысцін.

Не растваряюцца ў вадзе, у салявых растворах, разбаўленых к-тах і шчолачах; не гідралізуюцца стрававальнымі ферментамі большасці жывёл. Паводле структуры належаць да валакністых (фібрылярных) бялкоў. Складаюць гал. частку ахоўных і

покрыўных тканак жывёльных арганізмаў (напр., рагавога слоя эпідэрмісу, валасоў, поўсці, пазногцяў, капытоў, рагоў, пёраў).

Літ.: Гл. пры арт. *Бялкі.*

КЕРБАБАЕЎ Берды (н. 15.3.1894, аул Каўкі-Зерэнг, Туркменія), туркменскі савецкі пісьменнік і грамадскі дзеяч. Герой Сац. Працы (1969). Нар. пісьменнік Туркм. ССР (1967), засл. дз. маст. Туркм. ССР (1943). Акад. АН Туркм. ССР (1951). Чл. КПСС з 1948. З сялян. Вучыўся ў медрэсе і на ўсх. ф-це Ленінгр. ун-та (1927—28). Друкуецца з 1923. У паэмах «Дзявочы свет» (1928), «Ахвяра адата» (1929), «Да новага жыцця» (1930) паказаў цяжкую долю туркм. жанчыны ў мінулым. Паэма «Аму-Дар'я» (1931) пра сацыяліст. буд-ва ў рэспубліцы. У нарысах і апавяданнях 20—30-х г. малюнкі сац. і культурных пераўтварэнняў на вёсцы. У Айч. вайну выступаў з публіцыст. артыкуламі, напісаў п'есы «Любоў да Радзімы» (1941), «Курбан Дурды» (1942), «Браты» (1943). П'есы «Хурлукга і Хэмра» (1940), «Махтумкулі» (1943) на гістар. тэмы. Раман «Вырашальны крок» (т. 1—3, 1940—55, Дзярж. прэмія СССР 1948) пра Кастр. рэв. і грамадз. вайну ў Туркменістане. Аповесць «Айсалтан з краіны белага золата» (1949, Дзярж. прэмія СССР 1951) прысвечана калгаснай вёсцы, раман «Небіт-Даг» (1957) — жыццю нафтавікоў. На аснове рамана «Цудам народжаны» (1967) напісаў драму «Кайгысыз Атабаеў» (1969, Рэсп. дзярж. прэмія імя Махтумкулі 1971). Аўтар кніг для дзяцей, перакладчык. У 1942—50, 1959—62 і з 1965 старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў Туркменістана. Узнаг. 3 ордэнамі Леніна, 3 інш. ордэнамі, медалямі.



Тв.: Бел. пер.— Батыр. [Апавяданні], Мн., 1961; у кн.: Каракумскія зоркі. Мн., 1969; рус. пер.— Стихи и поэма, М., 1962; Солнце с севера, М., 1971.

А. Улугбердыеў. Ашхабад.

КЕРБЕЛЬ Леў Яўхімавіч [н. 25.10(7.11).1917, с. Сямёнаўка Наваазыбкаўскага пав. Чарнігаўскай губ.], рускі савецкі скульптар. Нар. мастак РСФСР (1967), чл.-кар. АМ СССР (1962), праф. (1963). Чл. КПСС з 1963. Працуе ў галіне станковай і манумент. скульптуры. Аўтар помнікаў героям штурму Берліна (з У. Цыгалём, 1945, Берлін) і К. Марксу (1961, Масква, Ленінская прэмія 1962), скульпт. партрэтаў. Дзяржаўная прэмія СССР 1950. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

Літ.: Замошкин А. И., Л. Е. Кербель, М., 1967.

«КЕРЗАНА ЛІНІЯ», умоўная назва лініі, якую рэкамендаваў у 1919 Вярх. савет *Антанты* як усходнюю граніцу Польшчы. Праходзіла праз Гродна — Ялаўку — Нямірaў — Брэст-Літоўск — Драгунск — Усцілуг, на У ад Грубяшова, праз Крылоў і далей на З ад Равы-Рускай, на У ад Перамышля да Карпат.

У ноце Сав. ўраду 11.7.1920 міністр замежных спраў Англіі Дж. Керзан прапанаваў спыніць наступ Чырв. Арміі па гэтай лініі (адсюль назва «К. л.»). Калі ў час сав.-польскай вайны 1920 склалася крытычнае становішча для польскіх інтэрвентаў, польскі бурж. ўрад згадзіўся ў ліп. 1920 прызнаць «К. л.» як часовую граніцу. Аднак пасля змены абставін на фронце польскі ўрад адмовіўся ад сваіх абавязацельстваў. Былі захоплены зах. часткі Украіны і Беларусі. Паводле *Рыжскага мірнага дагавору 1921* польска-сав. граніца праходзіла далёка на У ад «К. л.». У вер. 1939 пасля распаду бурж. Польшчы ў выніку гітлераўскай агрэсіі сав. граніца праходзіла на З ад «К. л.». Крымская канферэнцыя 1945 вызначыла, што ўсх. граніца Польшчы павінна ісці ўздоўж «К. л.» з некаторым адступленнем на карысць Польшчы. 16.8.1945 у Маскве паміж СССР і нар.-дэмакр. Польшчай падпісаны дагавор пра канчатковае вызначэнне сав.-польскай граніцы, якая ў цэлым праходзіць па «К. л.».

КЕРЗІН Міхаіл Аркадзевіч [н. 16(28).3.1883, Пецярбург], беларускі і рускі савецкі скульптар, педагог. Засл. дз. маст. БССР (1939), праф. (1950). Займаўся (з 1899) скульптурай у С. Мамантава ў Маскве (керамічны з-д «Абрамцава»). У 1903—12 вучыўся ў Пецярбургскай АМ, адначасова вывучаў малюнак у студыі В. Мяшкова. Выкладаў у Веліжскай маст. школе (1918—23) і Віцебскім маст. тэхнікуме (1923—32). З 1932 працаваў у Мінску, з 1949 у Ленінградзе (заг. кафедры скульптуры Ін-та імя Рэпіна). Удзельнічаў у ажыццяўленні ленінскага плана манумент. прапаганды (помнік-калона «Рабесп'ер», 1918; пано «Праметэй выкрадае агонь з неба», 1918). Аўтар партрэтаў К. Маркса, Ф. Энгельса, У. І. Леніна (1932—33, для Дома ўрада БССР), Л. Собінава (1907—17), Г. Грыгоніса (1941), Г. Глебава (1949). Сярод інш. твораў: кампазіцыя «Рэпка» (1906—09), барэльеф «Пладаводства» (1913—14), скульпт. група «Шчаслівае юнацтва» (1937, не збераглася), кампазіцыя «Вечная памяць героям, якія загінулі ў барацьбе за Радзіму» (1947) і інш. Сярод вучняў К.— нар. мастакі БССР З. Азгур, А. Бембель, А. Глебаў, скульптары А. Арлоў, А. Жораў. Узнаг. ордэнам «Знак Пашаны». У Дзярж. маст. музеі БССР 3 работы К.



М. А. Керзін. Вечная памяць героям, якія загінулі ў барацьбе за Радзіму. Бронза. 1947. Дзярж. маст. музей БССР.

Літ.: Изобразительное искусство Белорусской ССР, М., 1957; Орлова М. Искусство Советской Белоруссии, М., 1960.

П. М. Герасімовіч. Мінск.

КЁРКЕГОР, Кіркегор (Kierkegaard) Сёрэн (5.5.1813, Капенгаген — 11.11.1855), дацкі філосаф, суб'ект. ідэаліст, папярэднік *экзістэнцыялізму*. Паводле К., філасофія не можа быць навуковай і сістэматычнай. Яна заўсёды асабістая і непарыўна звязана з існаваннем чалавека — экзістэнцыяльная. Навук.



Кераміка І. С. І. Палубес. Чатыры апосталы. Рэльеф. Маёліка. 2-я пал. 17 ст. Музей «Каломенскае». Масква.



1



2

Керамі́ка II. 1. В. Г. Гаўрылаў. «За зямлю, за волю, за лепшую долю». Блюда. Фарфор. 1969. Дзярж. маст. музей БССР. 2. Пячная паліваная кафля з выявай фантастычнага звера. Зялёная глазура. 17 ст. З раскопак на Магілёўшчыне. Магілёўскі абласны краязнаўчы музей. З. Ф. Ф. Зільберт. Мінск. Пласціна. Шамот, эмаль. 1968. Дзярж. маст. музей БССР.

3





1



2

Керамі́ка III. 1. У. Л. Кузняцоў. Дэкаратыўныя вазы. Тэракота, глазура. 1971. 2. М. В. Бяляеў. Бярэзіна. Шамот, эмаль. 1971. Дзярж. маст. музей БССР. З. М. М. Кузьцова. Зубр. Дэкаратыўны посуд. Керамі́ка. 1970. 4. Т. М. Паражняк. Абаронцы Брэста. Шамот, солі, глазура. 1969.



3



4



1



2



3

Кераміка IV. 1. В. А. Кірыленка. Ваза «Юбілейная». Фарфор. 1969. Дзярж. маст. музей БССР. 2. В. А. Леантовіч. Сервіз пад каву «Павуцінка». Фарфор. 1970. Мінскі фарфаравы з-д. 3. Т. М. Багданава. Пасудак пад квас. Маёлка. 1970. Барысаўскі камбінат прыкладнога мастацтва Маст. фонду БССР.

філасофія не можа адказаць, што рабіць чалавеку ў рэальным жыцці. Яна аддае асобу ва ўладу гісторыі, выключае яе самастойнасць і свабоду, пазбаўляе ад адказнасці за тое, што адбываецца. Свабоду К. разглядаў як свабоду «выбару». Асоба знаходзіць сябе толькі ў богу, бо толькі вера ў бога дае падставу яе быццю. Імкнучыся вызначыць свае адносіны да рэчаіснасці, чалавек непазбежна ўпадае ў роспач, што з'яўляецца шляхам да бога, у містычным невымоўным дыялогу з якім чалавек знаходзіць сябе. Рэакцыйная і антыдэмакр. філасофія К.— рэліг.-этычны сродак прыстасавання да бурж. рэчаіснасці. У 20 ст. стыль філасофствавання К. становіцца ўзорам для ірацыяналістычных плыняў.

Літ.: Гайденко П. П. Трагедия эстетизма. Опыт характеристики миросозерцания Серена Кьеркегора, М., 1970.

КЕРКО Антаніна Сцяпанаўна (н. 16.12.1925, в. Кіевец Белападляскага пав. Люблінскага ваяводства), перадавік лёгкай прамысловасці, Герой Сац. Працы (1971). У 1949—56 швачка-матарыстка арцелі «Камунарка» ў Баранавічах, з 1956 брыгадзір брыгады пашывачнага канвеера Баранавіцкай трыкатажнай ф-кі. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга.

КЕРНАЖЫЦКІ Канстанцін Іванавіч [25.9 (8.10).1902, в. Выдранка Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ.— 28.2.1942], беларускі савецкі гісторык. Канд. гістар. н. (1934). З сям'і святчэнніка. Скончыў БДУ (1926). Працаваў у Ін-це гісторыі АН БССР і БДУ дацэнтам да 1937. Даследчык гісторыі распаду феадалізму і фарміравання капіталізму на Беларусі. Адзін з складальнікаў зб. дакументаў «Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах» (т. 1, 1936).

Тв.: Аграрная рэформа ў Бабруйскім старостве і эканамічнае становішча яго насельніцтва з XVII да палавы XIX ст. (Фармаванне капіталізму). Мн., 1931; Да гісторыі аграрнага руху на Беларусі перад імперыялістычнай вайной, Мн., 1932; Гаспадарчай прыгонніка ў на Беларусі ў канцы XVIII і пер-шай палове XIX ст. (Да праблемы разлажэння феадалізму ў Беларусі), Мн., 1935.

Літ.: Достижения исторической науки в БССР за 50 лет (1919—1969 гг.) (Краткий очерк), Мн., 1970. *Л. С. Абэцэдарскі.* Мінск.

КЕРУБІНІ (Cherubini) Луіджы (14.9.1760, Фларэнцыя — 15.3.1842), кампазітар. Па паходжанні італьянец. З 1786 жыў у Парыжы. Інспектар (з 1795), праф. (з 1816), дырэктар (1822—41) Парыжскай кансерваторыі. Пісаў рэвалюц. гімны для святкаванняў у час Франц. бурж. рэвалюцыі. Адзін з заснавальнікаў і найб. значны прадстаўнік гераічнага жанру «оперы выратавання» («Ладаіска», паст. 1791; «Эліза», паст. 1794; «Два дні», ці «Вадавоз», паст. 1800). Сярод опер інш. жанраў вылучаецца «Медэя» (паст. 1797), вытрыманая ў духу рэвалюц.-гераічнага класіцызму. Развіў форму оперная увертюры.

Літ.: Асафьев Б. Глинка. 2 изд., М., 1950 (Добавление); Радиге А. Французские музыканты эпохи Великой французской революции, пер. с франц., М., 1934.

КЕРЧАНСКІ ПАЎВОСТРАЎ, усходняя частка Крымскага п-ва. Пл. каля 3 тыс. км². Паўд.-зах. ч. раўнінная, паўн.-ўсх. ўзгорыстая. Есць газевыя вулканы. Расліннасць стэпавая. Вял. жалезарудны басейн; ёсць нафта, газы, сера, гіпс, асфальт, марганец.

КЕРЧАНСКІ ПРАЛІЎ, паміж п-вамі Керчанскім і Таманскім. Злучае Чорнае м. з Азоўскім. Даўж. каля 41 км, шыр. 4—15 км, глыб. 5—15 м. Зімой плывучыя льды. На зах. беразе порт Керч.

КЕСАН-СІЦІ (Quezon City), горад на Філіпінах, на в-ве Лусон, на ПнУ ад Манілы. 545,5 тыс. ж. (1968). З 1948 афіц. сталіца Філіпін. Сюды пераведзена частка ўрадавых установ. Прамысловасць пераважна харчовая. Ун-т.

КЕСАРАВА Алена Паўлаўна [н. 22.9 (5.10). 1910, Вільня — 17.3.1972], бел. сав. вучоны ў галіне фізіялогіі чалавека і жывёл. Д-р біял. н. (1960), праф. (1961). Чл. КПСС з 1946. Скончыла Смаленскі мед. ін-т (1931). Удзельнік Айч. вайны. З 1949 заг. кафедры фізіялогіі і хіміі Бел. ін-та фіз. культуры, з 1964 праф. кафедры фізіялогіі чалавека і жывёл БДУ. Асн. працы па праблеме рэгуляцыі тонусу шкілетных мышцаў чалавека і пра ўплыў заняткаў спортам на арганізм, які расце. Нам. старшыні Бел. т-ва фізіёлагаў. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.

Тв.: Учение И. П. Павлова — естественно-научная основа физического воспитания, Мн., 1953; Тонические рефлексы у тренированных людей, у кн.: Труды Ин-та физиологии АН БССР, т. 2, Мн., 1958; Тонус скелетных мышц и его регуляция у здорового человека, Мн., 1960; (у сааўт.) О рефлекторном механизме влияния с рецепторов полукружных каналов на скелетные мышцы, у кн.: XI съезд Всесоюзного физиологического общества им. И. П. Павлова, т. 2, Л., 1970 (Тезисы научных сообщений).

КЕСАРАВА СЯЧЭННЕ (кесарское сячэнне), аперацыя рассячэння брушной сценкі (брушнасценачнае К. с.) або похвы (похвеннае К. с.) і маткі ў цяжарнай жанчыны для нараджэння дзіцяці. Робяць, калі нармальныя роды немагчымыя.

Літ.: Слепых А. С. Абдоминальное кесарево сечение в современном акушерстве, М., 1968.

КЕСОН (ад франц. caisson скрыня), 1) у гідратэхнічным будаўніцтве — адкрытая знізу камера з воданепранікальнымі сценамі і столлю для работы пад вадой і ў воданасычаным грунце (гл. рыс.).

Вада з рабочай камеры К. выціскаецца напампаваным паветрам. Для дастаўкі людзей і матэрыялаў, вымання грунту выкарыстоў-



Схема кесона: *1* — рабочая камера; *2* — кесон; *3* — надкесонная кладка; *4* — прыстасаванне шлюзавога апарата для выдалення грунту і падачы матэрыялу; *5* — лябёдка; *6* — цэнтральная камера шлюзавога апарата; *7* — прыкамерак для людзей; *8* — шахтавая труба; *9* — труба для сціснутага паветра.

ваюцца шлюзавыя апараты, якія злучаюцца з К. шахтавымі трубамі. З апусканнем К. пад дзеяннем уласнай вагі зверху нарошчваецца муроўка сцен збудавання ці фундамента. На патрэбнай глыбіні камеру запаўняюць муроўкай або бетонам, і К. астаецца ў збудаванні. Найб. пашырэнне набылі К. з жалезабетону, робяцца таксама сталёвыя і драўляныя. Выкарыстоўваюцца ў буд-ве помпавых станцый і водазабораў, шлюзаў, глыбокіх фундаментаў маставых апор, для праходкі тунеляў і інш.

2) У суднарамонтных работах К.— воданепранікальная агароджа для работы ніжэй узроўню вады. Пасля адпампоўвання вады з К. ён прыціскаецца да пашкоджанай часткі корпуса судна ціскам вады звонку. 3) У архітэктуры — паглыбленне на столі, унутр. паверхнях арак, скляпенняў, звычайна квадратнай ці інш. многавугольнай формы. Служыць для маст. аздаблення перакрыццяў і паляпшэння акустыкі памяшканняў.

КЕСОНЫ (у металургіі), 1) сталёвыя каробкі, запоўненыя ахаладжальнай вадой, з якіх складаюцца сценкі шахтавых плавільных печаў (ватэржакетных печаў). К. ўбудоўваюцца таксама ў сцены галовак мартэнаўскіх печаў. 2) Сталёвыя кажухі, якія ізалююць ад глебы паглыбленыя ў яе рэгенератары мартэнаўскіх печаў.

КЕТА (Oncorhynchus keta), каштоўная прамысл. рыба сям. ласасёвых. Пашырана ў паўн. частцы Ціхага ак.



1. Кета; 2. Кета ў шлюбным уборы.

Цела серабрыстае, даўж. да 1 *м*. Маса да 10 *кг*. Самцы большыя за самак. Полавая спеласць настае ў 3—6 гадоў. У час нерасту ідзе ў рэкі, зменьвае колер цела, у самцоў загінаюцца сківіцы. Адклаўшы ікру, гіне. Жывіцца рыбаю (пясчанкамі, селядцамі і інш.). Ад К. атрымліваюць каштоўную чырвоную ікру.

Літ.: Никольский Г. В. Частная ихтиология, 3 изд., М., 1971.

КЕТОНАВЫЯ ЦЕЛЫ, група арганічных злучэнняў, тое, што *ацэтонавыя целы*.

КЕТОНАКІСЛОТЫ (кетакіслоты), арганічныя злучэнні, у малекуле якіх ёсць кета-група (гл. *Кетоны*) і карбаксільная група (—COOH). Разам з альдэгідакіслотамі складаюць клас оксакіслот.

Паводле ўзаемнага размяшчэння груп падзяляюцца на α- (піравінаградная, $CH_3COCOOH$), β- (ацэтавоцатная, CH_3COCH_2COOH), γ- (левулінавая, $CH_3COCH_2CH_2COOH$) і інш. К. Узаемны ўплыў функцыянальных груп у α- і β-К. выклікае ўзнікненне своеасаблівых уласцівасцей (здольнасць да распаду, *таўтамерыю* і інш.). Найб. значэнне мае этылавы эфір ацэтавоцатнай К. (т. зв. *ацэтавоцатны эфір*).

Літ.: Несмеянов А. Н. и Несмеянов Н. А. Начала органической химии, кн. 1, М., 1969. *М. А. Маер.* Мінск.

КЕТОНЫ, арганічныя злучэнні, у малекуле якіх ёсць карбанільная група (>C=O), звязаная з двума арганічнымі радыкаламі (група >CO у К. наз. кета-групай). Разам з *альдэгідамі* складаюць клас карбанільных злучэнняў.

У залежнасці ад радыкалаў, звязаных з кета-групай, падзяляюцца на аліфатычныя (тлустыя), араматычныя і інш. Вельмі рэакцыяздольныя, лёгка ўступаюць у рэакцыі замяшчэння, далучэння, кандэнсацыі. Атрымліваюць раскладаннем аралкілгідраперакісаў, дэгідраваннем другасных спіртоў, акісленнем вуглевадародаў і інш. Шырока выкарыстоўваюцца як растваральнікі (напр., *ацэтон*) і паўпрадукты (цыклагексанон у вытворчасці капрону) у арган. сінтэзе. Прыродныя К. (камфора, цыбетон, мускон) ужываюцца ў медыцыне і парфумерыі.

Літ.: Несмеянов А. Н. и Несмеянов Н. А. Начала органической химии, кн. 1—2, М., 1969—70.

КЕФАЛІ (Mugilidae), сямейства рыб атр. кефалепадобных. 15 родаў, каля 100 відаў. Пераважна марскія рыбы, пашыраныя ў вадаёмах трапічных і ўмераных шырот. У СССР (у Чорным, Азоўскім, Каспійскім, Японскім м.) 6 відаў з роду Mugil. Прамысловыя — лабан (M. cephalus), сінгіль (M. auratus), вастранос (M. saliens). Мяса К. з высокімі смакавымі якасцямі, мае да 22% тлушчу.



Лабан.

Цела К. даўж. да 75 *см*. Маса да 3,5 *кг*. Рот маленькі, зубы слабыя. Полавая спеласць настае на 3—8 годзе. Нерастуюць у вер.— кастр. Для нагулу заходзяць у залівы, ліманы. Жывяцца раслінными рэшткамі і дробнымі беспазваночнымі.

Літ.: Бабаян К. Е. Кефали. Биология, способы лова и выращивания, М., 1965.

КЕФІР, гл. ў арт. *Малочныя прадукты*.

КЕЦХАВЕЛІ Уладзімір (Ладо) Захаравіч [2(14).1.1876, в. Тквіяві Гарыйскага пав. Тыфліскай губ.—17(30).8.1903], прафесійны рэвалюцыянер. З сям'і свяшчэнніка. У 1893 за арганізацыю забастоўкі семінарыстаў выключаны з Тыфліскай духоўнай семінарыі. У 1894—96 удзельнічаў у марксісцкіх гуртках Кіева. З 1897 чл. груз. с.-д. арг-цыі «Месаме-дасі»; у 1898—1900 чл. Тыфліскага к-та РСДРП. Адзін з стваральнікаў Бакінскай парт. арг-цыі, чл. яе к-та. Арганізатар падпольных друкарняў партыі, у т. л. друкарні «Ніна» (1901, Баку), дзе размнажалася газ. «Искра», друкавалася газ. «Брдзола» («Барацьба») і інш. парт. л-ра. Забіты паліцыяй у турме.

Літ.: Гегешидзе З. Т. Ладо Кецховели, М., 1959.

КЕЦЬ, рака ў Краснаярскім краі і Томскай вобл. РСФСР, правы прыток Обі. Даўж. 1621 *км*, пл. бас. 94,2 тыс. *км²*. Пачынаецца з балот Об-Енісейскага водападзелу. Цячэ па Зах.-Сібірскай раўніне. Рэчышча звілістае, шмат пратокаў. Гал. прытокі: Сочур, Арлоўка, Лісіца (левыя), Мендэль (правы). Жыўленне пераважна снегавое. Ледастаў з сярэдзіны ліст. да пач. мая. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 560 *м³/сек*. Суднаходная на 658 *км* ад вусця.

КЕШОКАЎ Алім Пшэмахавіч [н. 9(22).7.1914, с. Шалушка каля Нальчыка], кабардзінскі савецкі паэт. Нар. паэт Каб.-Балк. АССР (1964). Чл. КПСС з 1941. Скончыў Паўн.-Каўк. пед. ін-т (1935), Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС (1953). Удзельнік Айч. вайны. Друкуецца з 1934. Гераізм сав. людзей у Айч. вайну, сацыяліст. буд-ва адлюстраваны ў зб. «Каля падножжа гор» (1941), «Шлях конніка» (1946), «Зямля маладосці» (1948), «Вершы» (на рус. мове, 1951). Лірыка К. насычана філас. зместам, вылучаецца задушэўнасцю, вобразнай асацыятыўнасцю. Аўтар зб. «Вершы і паэмы» (1956), «Сагрэты камень» (1964), «Плячо ў плячо» (1970), дылогіі пра Кастр. рэвалюцыю і грамадз. вайну ў Кабардзіна-Балкарыі «Цудоўнае імгненне» (кн. 1—2, 1960), «Зялёны паўмесяц» (1966), п'ес «Альхо» (1950), «Апошняя вярста» (1970), кінасцэнарыя «Лавіна з гор» (1957). Перакладчык твораў А. Пушкіна, М. Лермантава і інш. Дэп. Вярх. Савета СССР 7—8-га скл. Дзярж. прэмія РСФСР імя М. Горкага 1968. Узнаг. 6 ордэнамі, медалямі.



Тв.: Рус. пер.— Избранное, т. 1—2, Нальчик, 1964; У меня в гостях, М., 1966; [Стихи], Нальчик, 1967; Тавро, М., 1969; Вершины не спят, кн. 1—2, М., 1970.

Літ.: Сокуров М. Г. Лирика Алима Кешокова, Нальчик, 1969; Гоффеншефер В. Путь всадника, М., 1969.

КЕЛЬН (Köln), горад у ФРГ, на зямлі Паўн. Рэйн — Вестфалія. Порт на р. Рэйн. Вузел міжнар. чыг., аўтамаб. і авіяц. зносін. 854 тыс. ж. (1968). Вялікі прамысл. і гандл.-фін. цэнтр. Машынабудаванне (аўтамабілі, лакаматывы, вагоны, судны, трактары, станкі, падымальна-транспартнае і энергаабсталяванне, дакладныя механізмы і інш.), хім., нафтахім., ваен. прамысловасць. Непадалёку ад К. здабыча бурага вугалю. Ун-т (з 1388).

«КЁР-АГЛЫ» («Кёраглу»), пашыраны на Б. Усходзе і ў Сярэдняй Азіі гераічны эпас пра жыццё і подзвігі легендарнага воіна, паэта-імправізатара Кёр-аглы, барацьбіта за нар. шчасце і справядлівасць. Блізкія сюжэты ў аснове нацыянальных эпічных твораў азербайджанскага і турэцкага («Кёр-аглы»), таджыкскага («Гургулі»), туркменскага («Гёраглы»), узбекскага, казахскага («Гораглы») і інш. народаў. Герой кожнага з іх — туркмен, мсцівец за бацьку, якога асляпіў тыран (Кёраглы — Сын сляпога).

Створаны «К.-а.» не пазней 17 ст. Напісаны прозай і вершамі (тадж. версія цалкам вершамі). Празаічная частка па маст. прыёмах падобная да казкі, вершаваную складаюць песні гераічнага і раманічнага характару. Сабраны і запісаны ў 1-й пал. 19 ст. Поўны тэкст эпасу на рус. мове ўпершыню выдадзены ў 1856 (азерб. версія).

Публ.: Рус. пер.— Кероглу, Баку, 1959.

Літ.: Каррыев Б. А. Об эпосе «Кёр-оглы», «Известия АН Туркменской ССР. Серия общественных наук», 1965, № 3.

КЖЫВАНЬ Анэля [1925, Падолія (Польшча) — 12.10.1943], удзельніца баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). 20.7.1943 добраахвотна ўступіла ў 1-ю Польскую дывізію імя Т. Касцюшкі — стралок жаночай роты аўтаматчыкаў. Вызначылася 12.10.1943 каля в. Леніна Горацкага р-на Магілёўскай вобл. Калі машына з дакументамі і раненымі загарэлася ад варожай бомбы, К., нягледзячы на небяспеку, кінулася іх ратаваць. Загінула на баявым пасту.

Літ.: Героини, в. 1, М., 1969, с. 226—235.

КЗЫЛ-АРДА (у 1853—1922 Пяроўск, у 1922—25 Ак-Мячэць), горад, цэнтр Кзыл-Ардзінскай вобл. Каз. ССР, на р. Сырдар'і. Засн. ў 1822 як крэпасць Ак-Мячэць. У 1924—29 сталіца Казахстана. Чыг. станцыя. 126 тыс. ж. (1971). Малочны, мяса- і хлебакамбінаты; з-ды металічных і гумавых вырабаў, «Аўтатрактарадэталь», асфальтавы, 3 цагельныя, гарбарны, рысаачышчальны, алейна-экстракцыйны, піваварны, рыбны; абутковая і трыкатажная ф-кі. Цэлюлозна-кардонны камбінат. Пед. ін-т, палітэхнікум, мед. і казахскае жаночае пед. вучылішчы. Тэатр. Краязнаўчы музей.

Літ.: Ахметов К., Кенжебаев М. и Киреев М. Город на Сыр-Дарье, Алма-Ата, 1968.

КЗЫЛ-АРДЗІНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ, у складзе Каз. ССР. Утворана 15.1.1938. Пл. 227 тыс. *км²*. Нас. 504 тыс. чал. (1971). Падзяляецца на 8 раёнаў; 3 гарады, 6 гар. пасёлкаў. Цэнтр г. Кзыл-Арда.

К.-А. в. размешчана ў ніжнім цячэнні Сырдар'і, у межах Туранскай нізіны. На ПнЗ градава-бугрыстыя пяскі — Прыаральскія Каракумы, на Пд пустыня Кызылкум, на ПдУ адгор'і хр. Каратау выш. да 1419 *м*. Карысныя выкапні: солі (спажыўная, мірабіліт і інш.), жал. руда, буд. матэрыялы. Клімат рэзка кантынентальны з гарачым і сухім летам і маласнежнай зімой. Сярэдняя т-ра студз. на Пн —14, на Пд —8, ліп. адпаведна 26 і 28 °С. Ападкаў 150—100 *мм* за год. Вегет. перыяд 200—240 дзён. Рака Сырдар'я са шматлікімі рукавамі і старыцамі. Азёры салёныя (Арыс, Ашчыколь, Жаксыкылыш) і прэсныя (Караколь, Какшэколь). На З вобласці Аральскае м. Глебы пустыннага тыпу, шэразёмы і бурыя, у даліне Сырдар'і



алювіяльна-лугавыя. Расліннасць паўпустынная (палынна-хмызняковая, палынна-ціпчаковая, салянкавая; на пясках зараснікі саксаулу). У пойме Сырдар'і тугайныя лясы і зараснікі трыснягу. На в-ве Барсакельмес у Аральскім м. запаведнік. Насяляюць вобласць казахі, рускія, карэйцы, украінцы; жывуць таксама беларусы. Сярэдняя шчыльн. 2,2 чал. на 1 км². Гарадскога нас. 54%. Гарады Кзыл-Арда, Аральск, Казалінск.

За гады Сав. улады створана машынабудаванне і металаапрацоўка, харч. і лёгкая прамысловасць, буд. індустрыя. У Кзыл-Ардзе з-д рамонту буд.-дарожных машын, «Аўтатрактарадэталь», ф-ка рамонту быт. тэхнікі; у Джусалы мех. з-д; у Аральску суднарамонтны. Рыбная прамысловасць (Аральскі рыбакамбінат, 5 рыбазаводаў). Прадпрыемствы мясной (Кзыл-Арда), малочнай (Кзыл-Арда, Аральск, Казалінск, Джалагаш, Чыілі), рысаачышчальнай (Кзыл-Арда, Казалінск, Чыілі), агароднінакансервавай, лікёра-гарэлачнай, піваварнай (Кзыл-Арда) прамысловасці. Камбінат «Аралсульфат» выпускае сульфаты і спажыўную соль. Гарбарны з-д, абутковая, трыкатажная, швейная, мэблевая фабрыкі, цэлюлозна-кардонны камбінат у Кзыл-Ардзе. У 1968 выпрацавана больш за 231 млн. *квт·гадз* эл.-энергіі. Аснова с. гасп.— рысасеянне, авечкагадоўля і мясная жывёлагадоўля, бахчаводства. На 1.1.1971 у К.-А. в. 17 калгасаў і 55 саўгасаў (у т. л. 24 рысаводчыя і 23 каракуляводчыя). Пасяўная пл. (тыс. *га*, 1970) 131, з іх пад збожжавымі (пераважна рыс) 66,8, тэхн. 0,2, агародніна-бахчавымі 3,9, кармавымі 60,1. На пач. 1971 (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 188,7 (у т. л. кароў 72,9), авечак і коз 1486,5, коней 47,4, вярблюдаў 23,4. Даўж. чыгунак 728 *км* (1970). Па тэр. вобласці праходзіць чыг. Арэнбург — Алма-Ата. Суднаходства па Аральскім м. і Сырдар'і. Пед. ін-т політэхнічны і с.-г. тэхнікумы, мед. і казахскае жаночае пед. вучылішчы. Казахскі драм. тэатр. Краязнаўчы музей. Абл. газ. «Ленин жолы» («Шлях Леніна») на казахскай і рус. мовах.

Літ.: Белокопытова М. А., Васильева М. С. и Тютюнников И. А. Кзыл-Ординская область, Алма-Ата, 1961; Казахстан, М., 1970 (Советский Союз). *С. А. Абдрахманаў.* Алма-Ата.

КІБА́ЛЬНІКАЎ Аляксандр Паўлавіч [н. 9(22).8.1912, в. Арэхава Вобл. Войска Данскога], рускі савецкі скульптар. Нар. мастак СССР (1963), правадз. чл. АМ СССР (1954). Чл. КПСС з 1964. Скончыў Саратаўскае маст.-прамысловае вучылішча (1932). Працуе ў галіне манумент. і партрэтнай скульптуры. Аўтар помніка М. Чарнышэўскаму (1953) і помніка-бюста А. Радзішчава (1956) у Саратаве, партрэта (1954) і помніка У. Маякоўскаму ў Маскве (1958; Ленінская прэмія 1959). Узначаліў калектыў аўтараў мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой» (1971). Дзярж. прэмія СССР 1949, 1951.



Іл. гл. на ўкл. да арт. *Мемарыяльны комплекс Брэсцкая крэпасць-герой.*

Літ.: Тупицын И. Кибальников, М., 1958.

КІБА́ЛЬЧЫЧ Мікалай Іванавіч [19(31).10.1853, г. Корап Чарнігаўскай губ.— 3(15).4.1881], дзеяч народніцкага руху ў Расіі, вынаходнік. З сям'і свяшчэнніка. З 1871 вучыўся ў Пецярбургскім ін-це інжынераў шляхоў зносін, з 1873 у Медыка-хірург. акадэміі. У 1875—78 знаходзіўся ў турме па абвінавачванні ў рэвалюц. прапагандзе. Чл. народніцкай арг-цыі «Зямля і воля», з 1879 агент Выканаўчага к-та «Народнай волі». Удзельнік замаху на цара Аляксандра II. 17.3.1881 арыштаваны і прыгавораны да пакарання смерцю. У турме, за некалькі дзён да пакарання, К. распрацаваў арыгінальны праект рэактыўнага апарата для палёту чалавека. Імем К. названы кратэр на адваротным баку Месяца.

Літ.: Черняк А. Я. Николай Кибальчич — революционер и ученый, М., 1960.

КІБЕРНЕ́ТЫКА (грэч. kybernētikē майстэрства кіраваць), навука пра агульныя законы пераўтварэння *інфармацыі* ў складаных сістэмах кіравання — машынах, жывых арганізмах і іх аб'яднаннях. К. вызначаюць яшчэ як навуку пра кіраванне складанымі сістэмамі. Розныя вызначэнні К. абумоўлены тым, што па-рознаму ацэньваюцца і вылучаюцца такія яе зыходныя паняцці, як інфармацыя, кіраванне, адваротная сувязь.

Узнікненне К. звязваюць з выданнем у 1948 твора амер. матэматыка Н. Вінера «Кібернетыка, ці Кіраванне і сувязь у жывёле і машыне» (рус. пер., М., 1958). Узнікненне К. звязана з развіццём навук. дысцыплін, што вывучаюць працэсы кіравання ў розных фіз. галінах, і абумоўлена патрабаваннямі практыкі, якая паставіла задачу стварыць складаныя прыстасаванні аўтам. кіравання. Значную ролю ў станаўленні К. як навукі адыгралі працы К. Шэнана, Дж. фон Неймана, У. Р. Эшбі, А. І. Берга, А. М. Калмагорава, В. М. Глушкова і інш.

Асн. раздзелы агульнай ці тэарэт. кібернетыкі: *інфармацыі тэорыя*, тэорыя кіравальных сістэм (вывучае прынцыпы пабудовы пераўтваральнікаў інфармацыі і іх узаемадзеянне з аб'ектамі кіравання), *аўтаматаў тэорыя*, тэорыя вялікіх сістэм (даследуе складанасць, ступень арганізаванасці і метады пабудовы складаных сістэм, напр. стварэнне *аўтаматызаваных сістэм кіравання вытворчасцю*). Дастасаванне яе ідэй і метадаў да сістэм кіравання канкрэтнай прыроды — мэта спец. раздзелаў К.: *тэхнічнай кібернетыкі*, *эканамічнай кібернетыкі*, *біёнікі*, матэм. лінгвістыкі (распрацоўка кібернетычных мадэляў мовы для аўтаматызацыі перакладу) і інш. К. вывучае агульнае, што ўласціва ўсім працэсам кіравання, незалежна ад іх фіз. прыроды, і ставіць сваёй задачай стварыць адзіную тэорыю гэтых працэсаў. Агульныя паняцці К. эфектыўныя ў шматлікіх галінах навукі і стымулююць іх развіццё. У перыяд навукова-тэхн. рэвалюцыі К. набывае значэнне тэарэт. асновы аўтаматызацыі вытворчасці і кіравання. У БССР пытанні тэарэт. і прыкладной К., пытанні праектавання і стварэння электронна-вылічальных машын (ЭВМ) і іх матэм. забеспячэння вывучаюцца ў АН (ін-ты матэматыкі, тэхн. кібернетыкі), Мінскім філіяле н.-д. цэнтра электронна-вылічальнай тэхнікі і ў інш. установах.

Асн. метад у К.— кібернетычнае мадэляванне: пабудова мадэляў, якія апісваюць істотныя рысы паводзін сістэм кіравання. Найчасцей гэта матэм. мадэлі, гал. сродкам даследаванняў якіх служыць матэм. апарат аналізу дыскрэтных велічынь. Зручныя спосабы апісання схем многіх пераўтваральнікаў інфармацыі даюць *матэматычная логіка*, *графаў тэорыя* і інш. Дзеянні над інфармацыяй адбываюцца паводле вызначаных правілаў — *алгарытмаў*. Спосабы пераўтварэння інфармацыі (у т. л. праграмаванне для ЭВМ) вывучаюцца *алгарытмаў тэорыяй*. Усякая сістэма кіравання складаецца з кіравальнай сістэмы і аб'екта кіравання. Нягледзячы на тое, што сістэмы кіравання вельмі розняцца сваёй прыродаю, канструкцыяй і прызначэннем, працэсы кіравання маюць шмат агульнага. Кіраванне заўсёды мэтавае. К. вывучае спосабы дасягнення пастаўленай мэты найлепшым (аптымальным) чынам (гл. *Аптымальнае кіраванне*). Такія спосабы распрацоўваюцца *аперацый даследаваннем*. Асн. тэхн. сродак пры вывучэнні кібернетычных мадэляў — ЭВМ. Гл. таксама *Вылічальная тэхніка*.

Літ.: Лернер А. Я. Начала кибернетики, М., 1967; Глушков В. М. Введение в кибернетику, Киев, 1964; Эшби У. Р. Введение в кибернетику, пер. с англ., М., 1959.

В. С. Айзенштат, М. А. Лепяшынскі. Мінск.

КІБРЫК Яўген Адольфавіч [н. 8(21).2.1906, г. Вазнясенск Херсонскай губ.], рускі савецкі графік. Нар. мастак СССР (1967), правадз. чл. АМ СССР (1962). Вучыўся ў Адэскім ін-це выяўл. мастацтваў (1922—25) і Ленінградскай АМ (1925—27). Майстар ілюстрацыі (1934—36, «Кала Бруньён», 1940—41, «Зачараваная душа» Р. Ралана; 1943—45, «Тарас Бульба» М. Гогаля; 1948—50, «Гераічныя быліны») і станковай графікі (серыя малюнкаў «Сталінград», 1943; «У. І. Ленін у 1917», 1947; «Ленін», 1947—59). Дзярж. прэмія СССР 1948. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Графіка.*

Літ.: Е. А. Кибрик, М., 1955.

КІВІ, ківі-ківі, бяскрылыя (Apterygiformes), атрад птушак-бегуноў. 3 віды, пашыраныя ў Новай Зеландыі (тыповыя прадстаўнікі фаўны акіянічных а-воў).

Маса да 3 *кг*. Дзюба доўгая з ноздрамі на канцы, ногі чатырохпальцыя. Апярэнне бураватае, мяккае. Крылы рудыментарныя. Косці непнеўматычныя. Жывуць у густых вільготных лясах. Размнажаюцца 2 разы на год. Нясуць пераважна 1 яйцо масай больш за 400 г. Начныя птушкі. Кормяцца беспазваночнымі, якіх знаходзяць па паху ў мяккай глебе. Ахоўваюцца.



Ківі звычайны.

Літ.: Кістяківський О. Б. і Корнеев О. П. Посібник з зоогеографії, 2 вид., Київ, 1968.

КІГА́ЛІ (Kigali), сталіца Рэспублікі Руанда, размешчана ў цэнтр. частцы краіны. Аўтамаб. дарогай злучана з найб. значнымі нас. пунктамі краіны. Аэрапорт. 26 тыс. ж. (1967). Рамесныя майстэрні па вытворчасці адзення, абутку, глінянага посуду, рэчаў хатняга ўжытку.

КІДА́ЛЬНАЯ ЗБРОЯ, старажытная зброя для непасрэднага паражэння ворага кідком з пэўнай адлегласці (кап'ё, *бумеранг*), а таксама розныя механізмы і машыны (напр., *катапульта*), якімі кідалі камяні, ядры, каб знішчыць ворага, зруйнаваць умацаваныя збудаванні (крэпасці, масты, будынкі). Са з'яўленнем агнястрэльнай зброі ў 14 ст. К. з. страціла сваё значэнне.



Кідальная зброя і кідальныя машыны: *1* — кап'ё; *2* — бумеранг; *3, 6, 7* — прашча; *4, 5* — лук; *8* — арбалет (самастрэл); *9* — аркбаліста; *10* — баліста; *11* — катапульта.

КІДА́ЛЬНАЯ МАШЫ́НА (кідальны канвеер), перасоўная пагрузачная машына. Гл. ў арт. *Трымер.*

КІДА́ННІ ЛЁГКААТЛЕТЫ́ЧНЫЯ, спартыўныя практыкаванні ў лёгкай атлетыцы: перамяшчэнні спартыўных снарадаў (кап'я, гранаты, дыска, молата, ядра) у пэўным кірунку.



Кіданні кап'я, дыска, штурханне ядра, кіданне молата.

К. л. выконваюцца на далёкасць. Каб дасягнуць найб. скорасці снарада, кідаюць (гл. рыс.) з разбегу (кап'ё, гранату), з павароту корпуса спартсмена (дыск, молат), з скачка (штурханне ядра). Месца прызямлення снарада абумоўлена пэўнай плошчай — сектарам ці калідорам. У праграму спаборніцтваў на Алімп. гульнях, пяршынствах Еўропы, СССР, БССР уключаюцца кіданні дыска, кап'я, молата, штурханне ядра.

Бел. школа кідання молата вядомая ў свеце, заснавальнік яе засл. трэнер СССР Я. М. Шукевіч. Значных поспехаў у кіданні молата дасягнулі бел. спартсмены: шматразовы рэкардсмен свету, чэмпіён Еўропы і СССР М. Крываносаў; чэмпіён XVII Алімп. гульняў (Рым, 1960) В. Рудзянкоў; чэмпіён XVIII Алімп. гульняў (Токіо, 1964), рэкардсмен свету, Еўропы, СССР Р. Клім; чэмпіён СССР А. Балтоўскі.

В. Р. Алабін. Мінск.

КІЕЎ (укр. Київ), сталіца, палітычны, эканамічны, навуковы і культурны цэнтр Украінскай ССР. Размешчаны на берагах Дняпра



Кіеў. Бульвар Шаўчэнкі.

ніжэй вусця Дзясны. Вял. вузел чыгунак і шашэйных дарог, рачны порт і аэрапорт. 1693 тыс. ж. (1971). Іл. гл. на ўкл.

Паводле падання, запісанага ў «Летапісе мінулых гадоў», К. заснаваны палянскімі князямі *Кіем, Шчэкам, Харывам* у канцы 6 — пачатку 7 ст. Упершыню ўпамінаецца ў летапісах пад 862 разам з Ноўгарадам і Полацкам. Пасля ўтварэння ў канцы 9 ст. старажытнарус. дзяржавы (гл. *Кіеўская Русь*) К. стаў яе палітэкан. цэнтрам. У 1240 К. захапілі і разбурылі войскі хана *Батыя*. Каля 1362 увайшоў у Вял. кн. Літоўскае, а пасля Люблінскай уніі 1569 — у Рэч Паспалітую. У выніку *вызваленчай вайны ўкраінскага і беларускага народаў 1648—54* Левабярэжная Украіна ўз'яднана з Расіяй, у 1654 у склад Рус. дзяржавы ўвайшоў і К. З 1797 К. цэнтр Кіеўскай губ., павет і ўсяго Паўд.-Зах. краю. У 70—80-я г. 19 ст. адзін з цэнтраў народніцкага руху на Украіне. Першы с.-д. гурток узнік у 1889. У 1897 створаны Кіеўскі «Саюз барацьбы за вызваленне рабочага класа». Пасля Лют. рэвалюцыі ў К. створаны Савет рабочых дэпутатаў. Перамогу Кастр. ўзбр. паўстання выкарыстала бурж.-нацыяналіст. Цэнтр. рада, якая захапіла ўладу ў горадзе. У студз. 1918 рабочыя К. ўзялі ўзбр. паўстанне супраць Рады і з дапамогай сав. войск разгромілі яе. 26.1(8.2).1918 у К. ўстаноўлена Сав. ўлада. З 1934 К. сталіца УССР. У пач. Вял. Айч. вайны сав. войскі разам з нар. апалчэнцамі 2 з паловай месяцы гераічна абаранялі горад (гл. *Кіеўская абарончая аперацыя 1941*). У гады ням.-фаш. акупацыі (20.9.1941—6.11.1943) у горадзе дзейнічала камуніст. падполле, якім кіравалі падпольныя гарком і райкомы КП(б)У. К. — горад-герой, у 1965 яму ўручаны медаль «Залатая Зорка», узнаг. 2 ордэнамі Леніна (1954, 1961).

Асн. галіны прамысловасці: машынабудаванне і металаапрацоўка, хімічная, буд. матэрыялаў, лёгкая і харчовая. Больш за 50% прадукцыі машынабудавання дае прыладабудаванне (складаная электравымяральная апаратура, кантрольна-вымяральныя прылады, сродкі аўтаматызацыі, фотаапараты, газавыя прылады і інш.). Транспартнае машынабудаванне (марскія рыбалавецкія траўлеры, рачныя судны, трамваі, тралейбусы, матацыклы і інш.), станкабудаванне (аўтаматы, паўаўтаматы, аўтам. лініі), дарожнае машынабудаванне (экскаватары і інш.). Вытворчасць вежавых кранаў, абсталявання для хім., лёгкай, харч. прамысловасці. Хім. прамысловасць (камбінат штучнага валакна, з-ды фармацэўтычны, лесахімічны, лакаў, фотарэактываў, рэгенератарнагумавы і інш.), паліграфічная (2 паліграфкамбінаты, кніжныя і папяровабелавыя ф-кі, ф-ка афсетнага друку), дрэваапрацоўчая (дрэваапр. камбінат, мэблевыя ф-кі, фанерны з-д). Камбінаты: буд. індустрыі, 3 домабудаўнічыя, азбеставаых вырабаў; з-ды цагельныя, шлакаблокаў, жалезабетонных вырабаў і інш. Лёгкая прамысловасць (Кіеўскі і Дарніцкі шаўковыя камбінаты; абутковыя і трыкатажныя ф-кі, швейнае аб'яднанне). Прадпрыемствы кандытарскай (ф-ка імя К. Маркса), мяса-малочнай (мясакамбінат, малочныя з-ды), вінаробнай (вінаробны, лікёра-гарэлачны і шампанскіх вінаў з-ды), тытунёвай прамысловасці. ЦЭЦ, Кіеўская ГЭС. Газаправод Дашава — К. У К. метрапалітэн (з 1960).

У 1971/72 навуч. г. ў К. 635 дашкольных дзіцячых устаноў, 298 агульнаадук. школ усіх тыпаў, 39 сярэдніх спец. навуч. устаноў, 18 ВНУ: *Кіеўскі універсітэт*, політэхн., інж.-буд., аўтамабільна-дарожны, мед., пед., гандлёва-эканам. ін-ты, ін-т інжынераў грамадз. авіяцыі, Укр. с.-г. акадэмія, тэхнал. ін-т лёгкай прамысловасці, тэхнал. ін-т харч. прамысловасці, ін-т нар. гасп., пед. ін-т замежных моў, ін-т тэатр. мастацтва, мастацкі ін-т, ін-т фіз. культуры, ін-т культуры, кансерваторыя. У К. (1971) *Акадэмія навук Украінскай ССР*, 81 НДІ; тэатры: оперы і балета імя Шаўчэнкі, рускі драм. імя Лесі Украінкі, укр. драм. імя Франка, аператы, лялек, юнага гледача імя Ленінскага камсамола; філармонія, 93 клубныя ўстановы, 13 музеяў, 227 масавых б-к, 137 кінаўстановак, Кіеўскі тэлецэнтр (з 1951). Гарадская газ. «Вечірній Київ» (з 1927).

У 1913 было 5 гарадскіх бальнічных устаноў на 1655 ложкаў (3,3 на 1 тыс. ж.), 326 урачоў (6,5 на 10 тыс. ж.). У 1940 працавала 51 бальнічная ўстанова на 9772 ложкі (114 на 10 тыс. ж.), 4364 урачы (52 на 10 тыс. ж.), 4518 чал. сярэдняга мед. персаналу (53 на 10 тыс. ж.). На пач. 1971 было 78 бальнічных устаноў на 23 127 ложкаў (137 на 10 тыс. ж.), 13 819 урачоў (82 на 10 тыс. ж.), 23 304 чал. сярэдняга мед. персаналу (138 на 10 тыс. ж.). Паліклінічную дапамогу аказваюць 116 амбулаторый і паліклінік; на прамысл. прадпрыемствах 24 урачэбныя пункты аховы здароўя, 269 фельч.-ак. пунктаў. У К. мед. ін-т, 20 мед. НДІ, 18 санаторыяў і дамоў адпачынку.

Галоўны корпус Кіеўскага універсітэта імя Т. Р. Шаўчэнкі.



Найб. старадаўнія помнікі К. — Залатыя вароты (11 ст.), *Сафійскі сабор* (1037), цэрквы Спаса на Берастове, Кірылаўская (12 ст.). У 17—18 ст. створаны ансамблі Сафійскага і Выдубецкага манастыроў, Кіева-Пячэрскай лаўры; у стылі барока пабудавана Андрэеўская царква (1747—53), Марыінскі палац (1752—55, абодва арх. В. Растрэлі). Класіцызмскія пабудовы — Арсенал (1784—1801), ун-т (1837—47). У пач. 19 ст. забудоўваецца Крашчацік, распрапоўваецца планіроўка Падола. Шматлікія эклектычныя будынкі паявіліся ў 2-й пал. 19 ст. (Уладзімірскі сабор, 1850—96; т-р оперы і балета, 1897—1901; і інш.). У сав. час створаны будынкі Савета Міністраў УССР (1934—38, арх. І. Фамін), Верх. Савета УССР (1936—39, У. Забалотны), стадыёна (1937—49, М. Грэчына), ансамбль Крашчаціка (1947—54, кіраўнік арх. А. Уласаў), новыя жылыя масівы (Первамайскі, Нівкі, Атрадны, Русанаўка, Дарніца), створаны метрапалітэн (пушчаны ў эксплуатацыю ў 1960); пабудаваны Палац спорту (1958—60), Палац піянераў (1965), аэрапорт у Барыспалі (1966), Палац культуры «Украіна» (1970). Помнікі: У. І. Леніну (1946), кн. Уладзіміру (1853), Багдану Хмяльніцкаму (1888), Т. Шаўчэнку (1939), Вечнай славы воінам Сав. Арміі, якія загінулі ў Айч. вайну (1957), гузельнікам студзеньскага паўстання 1918 (1967) і інш. У 1969 зацверджаны ген. план развіцця К. Музеі: укр. выяўл. мастацтва, рус. мастацтва, зах. і усх. мастацтва, укр. нар. мастацтва. Іл. гл. таксама на ўкл.

Літ.: История Киева, т. 1—2, Киев, 1963—64; Історія міст і сіл Української РСР. Київ, Київ, 1968; Даев Л. А., Позняк П. П. и Черп М. М. Киев. Короткий путівник, 5 вид., Київ, 1969; Каргер М. К. Древний Киев, т. 1—2, М.—Л., 1958—61; Логвин Г. Н. Киев, М., 1967; Шулькевич М. М. Киев, 1968; Пашко Я. Місто-герой на Дніпрі, Київ, 1969.

В. П. Рудэнка (гаспадарка), **У. Л. Зуч** (гісторыя), **Ф. А. Каллянкоў** (асвета). Кіеў.

КІЕЎСКАЯ АБАРОНЧАЯ АПЕРАЦЫЯ 1941, аперацыя сав. войск Паўд.-Зах. фронту ў Вял. Айч. вайну супраць гал. сіл ням.-фаш. войск групы армій «Поўдзень», праведзеная 10.7—29.9.1941.

Гітлераўскае камандаванне разлічвала ўдарамі 6-й арміі і 1-й танк. групы захапіць Кіеў да 10.7.1941. Сав. войскі гераічнай абаронай сарвалі план ворага. Па закліку Кампартыі і ўрада Украіны ў чэрв. Армію добраахвотна ступіла больш за 200 тыс. жыхароў і дзесяткі тыс. у нар. апалчэнне. У пач. жн. ням.-фаш. захопнікі прарваліся на блізкія подступы да горада, дзе разгарнуліся цяжкія баі. У бітве за Кіеў сав. войскі разгромілі больш за 10 варожых дывізій, знішчылі больш за 100 тыс. салдатаў і афіцэраў, шмат балвой тэхнікі. К. а. адыграла значную ролю ў зрыве планаў «маланкавай вайны» фаш. Германіі. 20.9.1941 па загаду Вярх. Галоўнакамандавання сав. войскі пакінулі Кіеў. У 1961 Кіеў за гераічную абарону ўзнаг. ордэнам Леніна і атрымаў найменне «горад-герой», установлены медаль «За абарону Кіева».

Літ.: Великая Отечественная война Советского Союза. 1941—1945. Краткая история, 2 изд., М., 1970; Багрампян Н. Х. Город-воин на Днепре, М., 1965.

КІЕЎСКАЯ ВОБЛАСЦЬ, у складзе УССР. Утворана 27.2.1932. Размешчана ў бас. сярэдняга цячэння Дняпра. Пл. 29 тыс. км². Нас. (без Кіева) 1837 тыс. чал. (1971). Падзяляецца на 24 раёны; 16 гарадоў, 31 гар. пасёлак. Цэнтр г. Кіеў.

Паверхня раўнінная. Паўн. частка ў межах Палескай нізіны, усх. — Прыдняпроўскай нізіны. На Пд і ПдЗ адгор'і Прыдняпроўскага ўзв. выш. да 273 м, парэзанага ярамі. Карысныя выкапні: буд. матэрыялы, торф, буры вугаль. Мінер. крыніцы. Клімат умерана кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. на Пн —6,5, на ПдЗ —5,5, ліп. адпаведна 17,5; 20 °С. Ападкаў 500—650 мм за год. Гал. р. Дняпро з прытокамі Прыпяць, Цецераў, Ірпень, Рось (правыя), Дясна, Трубеж, Супой (левыя). На тэр. вобласці ч. Кіеўскага вадасховішча. Глебы на Пн дзярнова-падзолістыя, у далінах рэк дзярнова-глеевыя, алювіяльныя, балотныя; у цэнтр. і зах. частках ападзоленыя чарназёмы, шэрыя і светла-



шэрыя ападзоленыя; на Пд малагумусныя чарназемы. Пад лесам каля 20% тэр. Насяляюць вобл. украінцы (92,1%), жывуць таксама рускія (6,1%), беларусы, яўрэі, палякі і інш. Сярэдняя шчыльн. 63,3 чал. на 1 км². Гарадскога нас. 37% (без Кіева). Найб. гарады: Белая Царква, Фастаў, Барыспаль, Бравары.

Асн. галіны прамысловасці: машынабудаванне і металаапрацоўка, харч., лёгкая, дрэваапр., прамысловасць буд. матэрыялаў. Найб. з-ды: «Электракандэнсатар», «Сельмаш», метал. вырабаў (Белая Царква), «Чырвоны Кастрычнік» (абсталяванне і запасныя часткі для хім. прамысловасці ў Фаставе), халадзільнікаў, бытавых машын (Васількоў), халадзільнікаў для гандл. прадпрыемстваў, электратэхн. вырабаў (Бравары), «Ірпеньторфмаш» (Ірпень) і інш. Харч. прамысловасць (17 цукр. заводаў, 28 малакаперапрацоўчых, 4 спіртавыя, 2 крухмальныя, мясакамбінат, птушкакамбінат); найб. цэнтр Белая Царква. У лёгкай прамысловасці найб. развіты: швейная (Белая Царква, Сквіра, Фастаў, Палескае, Пераяслаў-Хмяльніцкі), суконная (Багуслаў, Беразань), трыкатажная (Белая Царква, Бравары), гарбарнаабутковая (Белая Царква, Васількоў). Дрэваапрацоўка і прадпрыемствы буд. матэрыялаў (Белая Царква, Барыспаль, Васількоў, Багуслаў, Стайкі, Пераяслаў-Хмяльніцкі, Ірпень, Фастаў). Трыпольская ДРЭС. Будуецца (1972) Чарнобыльская атамная эл. станцыя. С. гасп. спецыялізуецца на вырошчванні цукр. буракоў, збожжа, бульбы і на малочна-мясной жывёлагадоўлі. На 1.1.1971 у К. в. 417 калгасаў і 121 саўгас. Пасяўная пл. (тыс. *га*, 1970) 1429,0, з іх пад збожжавымі 638,3, тэхн. 144,5, бульбай і агародніна-бахчавымі 190,3, кармавымі 455,9. Асн. збожжавая культура (тыс. *га*) пшаніца — 200,5, сеюць жыта, ячмень, авёс, кукурузу, проса, грэчку; з тэхнічных — цукр. буракі 118,6. Садоўніцтва. У пач. 1971 (тыс. галоў) буйн. раг. жывёлы 1020,9 (у т. л. кароў 469,5), свіней 942,6, авечак і коз 213,4. Пчалярства. Даўж. чыгунак 798 *км* (1969). Асн. чыг. магістралі: Масква — Кіеў — Львоў, Кіеў — Адэса, Кіеў — Харкаў, Кіеў — Днепрапятроўск — Данецк і інш. Аўтамаб. дарог 10,5 тыс. *км*, у т. л. з цвёрдым пакрыццём 4,0 тыс. *км*. Суднаходства па Дняпры, Дзясне, Прыпяці. У вобл. (без Кіева) с.-г. ін-т, 16 сярэдніх спец. навуч. устаноў. Муз.-драм. тэатр. Гістар. і краязнаўчы музеі. Абл. газ. «Київська правда».

Літ.: Наша Київщина, Київ, 1967; Украина. Районы, М., 1969 (Советский Союз).

М. С. Бачынская. Кіеў.

КІЕЎСКАЯ РУСЬ, раннефеадальная дзяржава ў 9 — першай трэці 12 ст., якая аб'яднала ўсходніх славян і некат. неславянскія народы. Цэнтр — Кіеў. Займала тэр. ад Прычарнаморскіх стэпаў да Паўн. Дзвіны, ад Днястра і Зах. Буга да Волгі і нізоўяў Акі (гл. карту на ўкл.). Тэр. Беларусі (Полацкае, Тураўскае і інш. княствы) увайшла ў К. Р. у канцы 9—10 ст. У 6—8 ст. у ўсх. славян узніклі тэр.-паліт. аб'яднанні — племянныя саюзы: паляне, ільменскія славяне, драўляне, севяране, палачане, крывічы, дрыгавічы, вя-



Свінцовая пячатка (правы і адваротны бок) Ізяслава Яраславіча (1024—1078). Ваўкавыск. Ваўкавыскі ваенна-гістарычны музей імя П. І. Баграціёна (злева). Медная пласціна з выявай святога Паўла. 12 ст. Гродна. Гродзенскі гісторыка-археалагічны музей.

цічы, радзімічы, валыняне, дулебы, бужане, ціверцы, улічы, белыя харваты. Паводле летапісаў у 6 з іх (палян, севяран, драўлян, дрыгавічоў, палачан, ільменскіх славян) вядомы дзяржаўныя ўтварэнні — «княжанні». Іх цэнтры: у палян Кіеў, у ільменскіх славян Ноўгарад, у полацкіх крывічоў (палачан) Полацк і інш. Паводле звестак араб. географаў, задоўга да стварэння К. Р. ў усх. славян было некалькі паліт. цэнтраў: *Куявія* (Кіеўская зямля), *Славія* (Паўн.-Зах. Русь), Артанія (месца знаходжання невядома). З распадам першабытнаабшчыннага ладу ў рамках племянных саюзаў фарміраваліся і развіваліся класавыя феад. адносіны. У 9—11 ст. яны сталі пануючымі. Рабства ў усх. славян мела патрыярхальны характар і не развілося ў рабаўладальніцкую фармацыю. Прыблізна ў 9—10 ст. сваяцкія ўсх.-славянскія плямёны складаліся ў адзіную старажытнарускую народнасць, што характарызавалася адноснымі эканам. сувязямі, этнічнай, тэрытарыяльнай, культ. і моўнай агульнасцю.

Дзярж. лад К. Р. — раннефеадальная манархія. Цэнтр. ўлада належала князю, які кіраваў ваен. сілай, знешняй палітыкай і праз назначаных пасаднікаў, тысяцкіх, соцкіх, цівуноў, вірнікаў гасп., фін. і судовай справамі. У многіх гарадах К. Р. існавала *веча*. З развіццём феадалізму ўскладняліся функцыі і арганізацыя кіравання. Асабістая *дружына* князя заменьваецца войскам з дружын феадалаў і часам нар. апалчэннем; *палюддзе* — нарміраванай данінай (урокамі); у вырашэнні важных пытанняў значную ролю адыгрываў княжаскі савет з баяр і старэйшых дружыннікаў (гл. *Баярская дума*). Эканам. асновай К. Р. была феад. ўласнасць на зямлю, што абумовіла залежнасць сялян, рамеснікаў і гандляроў ад феадалаў. Большасць феад.-залежнага насельніцтва была асабіста свабодная, але былі і асабіста залежныя. Да залежных належалі халопы, радовічы, закупы; «лю-

Наканечнік кап'я. 12—13 ст. Мінск. Дзярж. маст. музей БССР.





1



2



3



4



5

Кіеў.

1. Сафійскі сабор. 1037.
2. Плошча імя Калініна.
3. Будынак Вярхоўнага Савета УССР.
4. Помнік Вечнай славы воінам Савецкай Арміі, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну 1941—45.
5. Рачны вакзал.
6. Цэнтральная магістраль горада — Крашчацік.
7. Русанаўскі жылы масіў.
8. Палац спорту.



6



7





1



2



3



4



5



6



7



8

Кіеўская Русь. 1. Сафійскі сабор у Кіеве (інтэр'ер). 11 ст. 2. Сафійскі сабор у Ноўгарадзе. 11 ст. 3. Залатыя вароты ва Уладзіміры. 12. ст. 4. Сафійскі сабор у Полацку (апсіда). 11 ст. 5. Ваявода Воўчы Хвост заваёўвае радзімічаў. Мініяцюра з Радзівілаўскага летапісу. 6. Медальён з адбіткам св. Дзмітрыя. 12 ст. Ваўкавыск. Ваўкавыскі ваенна-гістарычны музей імя П. І. Багратыёна. 7. Рэчы з раскопак Лукомля, Лагойска і кургана каля в. Вейна Лагойскага раёна. 11—13 ст. 8. Абразок з адбіткам Спаса Эмануіла. 12 ст. Пінск. Інстытут гісторыі АН БССР. 9. Фрэска Спаскай царквы Ефрасінеўскага манастыра ў Полацку. 12 ст. 10. Грэбень. Самшыт. 13 ст. Мінск. Дзярж. маст. музей БССР. 11. Шахматная пешка. Косць. 12 ст. Ваўкавыск. Дзярж. маст. музей БССР.



9



10



11

КІЕЎСКАЯ РУСЬ у IX—пачатку XII ст.





дзіе; да феад. вярхоў — князі, баяры, мужы; феад. адміністрацыі — тысяцкі, пасаднік, агнішчанін, цівун, мечнік, вірнік, ратайны староста. Умацненне феад. прыгнёту ў К. Р. няраз выклікала нар. паўстанні (у Суздальскай зямлі 1024 і 1071, у Кіеве 1068, 1113). Асновай гаспадаркі К. Р. была с.-г. вытворчасць. Пераважала ворыўнае земляробства ў форме двухполля ці трохполля, хоць захавалася і ляднае (падсечнае) земляробства. Гал. с.-г. культуры — жыта, пшаніца, ячмень, проса, авёс, лён. Значную ролю ў гаспадарцы адыгрывалі паляванне, рыбалоўства, бортніцтва, гандаль (гл. *Шлях з «варагаў у грэкі»*). Асн. тып паселішчаў — маладворныя адна-, двухраднай планіроўкі без абарончых умацаванняў — весь, пагост, мір, свабода («слабада»), сяло, дзярэўня, верв; у лясной зоне пераважалі зрубныя пабудовы, у стэпавай — паўзямлянкі. Феад. знаць будавала ўмацаваныя двары, замкі. Аддзяленне рамяства ад с. гасп. абумовіла ўзнікненне гарадоў. Найб. старажытныя гарады К. Р.: Кіеў, Ноўгарад, Смаленск, Ладага, Ізборск, Растоў, Белавозера (Белазерск), на тэр. Беларусі — Полацк, Тураў, Бярэсце (Брэст), Відбеск (Віцебск), Рша (Орша), Слонім, Меньск (Мінск). Гарады ўзнікалі на водных гандл. шляхах, у развітых с-г. раёнах. Яны складаліся з цэнтр., найб. умацаванай часткі — *дзядзінца* і ўмацаванага або неўмацаванага пасада. Асн. крыніца паліт. гісторыі К. Р.— старажытнарус. летапісы (датаванне падзей з 852). У пач. летапісаў паведамляецца пра рассяленне ўсх.-слав. плямёнаў, пра заснаванне Кіева легендарным Кіем (гл. *Кій, Шчэк, Харыў*). Пазней у летапісы ўведзена легенда пра запрашэнне варажскага князя (862; гл. *Нарманская тэорыя*) паўлегендарнага *Рурыка* [862—879], пра князёў *Аскольда і Дзіра*, якія ў 862 авалодалі Кіевам. Пасля смерці Рурыка ўлада ў Ноўгарадзе перайшла (879) да кн. *Алега*, які з дружынай у 882 авалодаў і Кіевам, забіўшы Аскольда і Дзіра. У 9—11 ст. кіеўскія князі пашырылі ўладу на ўсё ўсх. славянства і на некат. неславянскія народы фіна-угорскага (мурама, мера, весь), балтыйскага (голядзь), цюркскага (торкі, берандзеі) паходжання. Пры Алегу К. Р. аб'яднала ільменскіх славян, крывічоў, палян, драўлян, дрыгавічоў, севяран і радзімічаў з гарадамі Кіевам, Ноўгарадам, Полацкам, Чарнігавам, Пераяславам, Смаленскам, Растовам (у верхнім Паволжы) і інш. Яго пераемнік *Ігар* [912—945] падпарадкаваў ніверцаў і улічоў, расшырыў уладанні К. Р. да Чорнага м. У 945 драўляне паўсталі, забілі Ігара за збіранне празмернай даніны. Удава Ігара кн. *Вольга* [945—964] жорстка расправілася з драўлянамі, аднак вызначыла пэўныя памеры даніны (урокі) і месца яе збору — пагосты. Сын Ігара і Вольгі *Святаслаў Ігаравіч* [964—972] у выніку паходаў на Аку і Волгу далучыў вяцічаў, перамог хазараў і дунайскіх балгар. У 970 Святаслаў падзяліў К. Р. паміж сынамі: Кіеўскую зямлю перадаў Яраполку, Драўлянскую — Алегу, Ноўгарадскую — Уладзіміру.

Старонка Тураўскага евангелля. 11 ст. Касцяны арнаментаваны выраб. 12 ст. Навагрудак. Дзярж. музей БССР.





Яраполк [972 — каля 978] забіў Алега (977), напалоханы Уладзімір уцёк з Ноўгарада (977), і К. Р. зноў аб'ядналася. Аднак у 980 Уладзімір вярнуўся з варагамі, заняў Ноўгарад, Полацк і рушыў на Кіеў. Яраполк быў забіты. У час княжання *Уладзіміра Святаславіча* [980—1015] і яго сына *Яраслава Мудрага* [1019—54] К. Р. дасягнула найвышэйшага росквіту. Уладзімір аб'яднаў усе землі ўсх. славян, умацаваў дзярж. кіраванне, увёў хрысціянства як дзярж. рэлігію (988—989). У 984 дружына кн. Уладзіміра на чале з ваяводам Воўчы Хвост перамагла радзімічаў на р. Пішчане і прымусіла іх плаціць даніну. Пры Яраславе складзена найб. стараж. ч. «Рускай праўды» — зборніка законаў К. Р. Кіеўскія князі вялі актыўную знешнюю палітыку. У выніку паходу Алега на Царград (каля 911) з Візантыяй падпісаны выгадны для К. Р. дагавор. Кн. Ігар хадзіў у 913—943 у Закаўказзе, у 941 і ў 943—944 на Візантыю. Святаслаў Ігаравіч разграміў Хазарскі каганат (965), падпарадкаваў *Балгарыю Волжска-Камскую*; імкненне замацавацца на Дунаі прывяло да канфлікту з Візантыяй (971). Уладзімір умацаваў паўд. граніцы, каб бараніцца ад нападаў печанегаў, змагаўся супраць Польшчы і Візантыі. К. Р. мела гандл., паліт. і культ. сувязі з Сярэдняй Азіяй, Паўн. Прычарнамор'ем, Візантыяй, Б. Усходам, ням. землямі, Скандынавіяй, Францыяй, Прыбалтыкай, экспартавала футра, мёд, воск, лён, палатно, рабоў; прывозіла каштоўныя тканіны, каляровыя металы, высокамастацкае начынне. Аб высокім міжнар. аўтарытэце К. Р. сведчаць дынастычныя шлюбы кіеўскіх князёў з правячымі дынастыямі Германіі, Англіі, Францыі, Візантыі, Скандынаўскіх краін. Развіццё прадукц. сіл, пашырэнне феад. землеўладання, імкненне феадалаў стварыць на месцах моцную ўладу абумовілі феад. раздробленасць К. Р. У 1-й чвэрці 11 ст. Ноўгарад і Полацк спрабавалі аддзяліцца ад Кіева. У 2-й пал. 11 ст. Яраславічы (старэйшыя сыны Яраслава) Ізяслаў (уладаў Кіевам, Ноўгарадам, Туравам), Святаслаў (княжыў у Чарнігаве) і Усевалад (валодаў Пераяслаўскім і Суздальскім княствамі) супольна змагаліся супраць полацкага князя Усяслава Брачыславіча, які не падпарадкоўваўся ўладзе Кіева. З 70-х г. 11 ст. пачалася міжусобная барацьба паміж Яраславічамі. *Любецкі з'езд* князёў (1097) намагаўся скончыць з усобіцамі, але яго рашэнні былі парушаны. *Уладзіміру Манамаху* ў 1-й пал. 12 ст. ўдалося часова затрымаць працэс раздраблення К. Р. Пасля яго смерці (1125) К. Р. канчаткова распалася на самастойныя дзярж. ўтварэнні. Найб. з іх: Уладзіміра-Суздальскае, Кіеўскае, Смаленскае, Чарнігаўскае, Полацкае, Пераяслаўскае, Галіцкае, Уладзіміра-Валынскае, Турава-Пінскае княствы і Ноўгарадская феад. рэспубліка. Улада кіеўскіх князёў у адносінах да іх была толькі намінальная. Раздрабленне К. Р. выкарысталі полаўцы, польскія, літоўскія, венгерскія феадалы. У 1-й пал. 13 ст. адасобленыя княствы не змаглі адбіць нашэсця манголататар і надоўга трапілі ў залежнасць ад іх. Зах. землі К. Р. ўвайшлі ў *Вялікае княства Літоўскае*. Археал. матэрыялы і пісьмовыя крыніцы сведчаць пра высокі ўзровень культуры К. Р. Яе асновай была культура ўсходніх славян, якая ўспрыняла элементы візант. культуры. Ёсць падставы меркаваць пра існаванне арыгінальнай слав. пісьменнасці да кірылічнага пісьма, школ. Пра пашырэнне пісьменнасці ў К. Р. сведчаць *летапісы*, перакладная і арыгінальная л-ра, *берасцяныя граматы*, надпісы на рэчах і збудаваннях. Яраславам у Кіеве засн. бібліятэка, у манастырах арганізаваны перапіска і пераклад кніг (у Полацку перапіскай кніг займалася *Ефрасіння Полацкая*). Кнігі ўпрыгожваліся застаўкамі, мініяцюрамі. Найб. стараж. помнікі пісьменнасці — «Астрамірава евангелле» (1056—57), «Тураўскае евангелле» (12 ст.), «Ізборнікі Свята-



Бронзавая падвеска з Заслаўскага курганнага могільніка. 11 ст. Дзярж. музей БССР.

слава» (1073, 1076), «Аповесць мінулых часоў» — летапісны збор, складзены ў пач. 12 ст. на аснове больш ранніх летапісаў. Яго можна лічыць вытокам і родапачынальнікам трох братніх усходнеславянскіх л-р: рус., укр., бел. Развівалася аратарска-прапаведніцкая, дыдактычная проза (Феадосій Пячэрскі, Іларыён, Кірыла Тураўскі і інш.). Складаліся песні пра падзеі і герояў К. Р. Найвыш. дасягненне л-ры — «Слова аб палку Ігаравым». Распаўсюджваліся творы вуснага нар. эпасу. Архітэктура К. Р. пераважна драўляная. З прыняццем хрысціянства будаваліся манументальныя мураваныя храмы спачатку візантыйскімі, пазней мясцовымі майстрамі. Храмы ўпрыгожвалі керамічнымі пліткамі, фрэскавым роспісам, мазаікай, абразамі і ювелірнымі вырабамі. Майстрамі К. Р. створаны цудоўныя творы дойлідства: Сафійскія сабо-ры ў Кіеве, Ноўгарадзе, Полацку (гл. адпаведныя артыкулы). Да традыцый дойлідства К. Р. далучаецца на тэр. Беларусі шэраг збудаванняў 12 ст., якім характэрны рысы мясцовых арх. школ: *Спаса-Ефрасіннеўская царква* ў Полацку, комплекс у *Бельчыцах*, *Гродзенскія Ніжняя царква*, *Барысаглебская царква* ў Гродне, *Благавешчанская царква* ў



Спаса - Ефрасіннеўская царква ў Полацку. 12 ст. (рэканструкцыя).

Віцебску. Развівалася і свецкая манументальная архітэктура. Археал. знаходкі, пісьмовыя крыніцы і творы жывапісу сведчаць пра шырокае распаўсюджванне ў К. Р. царкоўнай і свецкай музыкі. Па ўзроўні культуры К. Р. стаяла ў шэрагу перадавых краін свайго часу. К. Р.— важны этап у гісторыі народаў Усх. Еўропы, вынік грамадска-эканам., паліт. і культ. іх развіцця. К. Р. аб'ядналася разрозненыя сілы ўсх. славян, стварыла спрыяльныя ўмовы для іх развіцця. Кіеўская Русь — радзіма трох усходнеславянскіх народнасцей — рускай, украінскай, беларускай. Іл. гл. таксама на ўкл.

Кр.: Повесть временных лет, ч. 1—2, М.—Л., 1950; Полное собрание русских летописей, т. 2— Ипатьевская летопись, М., 1962; Памятники русского права, в. 1, М., 1952.

Літ.: История СССР с древнейших времен до наших дней, т. 1, М., 1966; Гісторыя Беларускай ССР, т. 1, Мн., 1972; Татищев В. Н. История Российская, т. 1—2, М.— Л., 1962—63; Карамзин Н. М. История государства Российского, т. 1 — 4, М., 1903; Ключевский В. О. Соч., т. 1, М., 1956; Греков Б. Д. Киевская Русь, М., 1953; Рыбаков Б. А. Древняя Русь. Сказания. Былины. Летописи, М., 1963; Пашуто В. Т. Внешняя политика Древней Руси, М., 1968; Древнерусское государство и его международное значение, М., 1965; Юшков С. В. История государства и права СССР, ч. 1, М., 1961; Тихомиров М. Н. Древнерусские города, 2 изд., М., 1956; Мавродин В. В. Образование древнерусского государства, Л., 1945; Брайчевський М. Ю. Походження Русі, Київ, 1968; Штыхов Г. В. и Лысенко П. Ф. Древнейшие города Белоруссии, Мн., 1966.

П. Ф. Лысенка, Г. В. Штыхаў. Мінск.

КІЕЎСКАЯ СВІТА, адклады познепаэацэнавай эпохі *палеагенавага перыяду*. Вылучана ў 1893 рус. геолагам М. А. Сакаловым. Пашырана на Пд Беларусі. Складзена пераважна з марскіх адкладаў — мергеляў, глінаў, алеўрытаў, пяра-зялёных дробна- і тонказярністых глаўканітава-кварцавых пяскоў з фасфарытавай галькай. Магутнасць да 63 *м*, сярэдняя 20—30 *м*. Узрост К. с. вызначаны на аснове вывучэння фарамініфер і спора-ва-пылкавых комплексаў.

КІЕЎСКІ УНІВЕРСІТЭТ імя Т. Р. Шаўчэнкі, вышэйшая навуч. ўстанова. Адкрыты ў 1834 у Кіеве ў складзе двух ф-таў — філасофскага (з аддз. гісторыка-філал. і фізіка-матэм.) і юрыдычнага. У 1841 адкрыты мед. ф-т. У складзе гэтых ф-таў існаваў да 1920. У 1920—30 на базе ун-та працаваў Ін-т нар. адукацыі, з 1930 ін-ты сацыяльнага выхавання, прафесійнай адукацыі і фізіка-хіміка-матэматычны. У 1933 ін-ты рэарганізаваны ў адзіную навуч. ўстанову і адноўлены ун-т. Імя Шаўчэнкі прысвоена ў 1939. Ф-ты ў 1971/72 навуч. г.: біялагічны, геаграфічны, геалагічны, журналістыкі, вамежных моў, гістарычны, кібернетыкі, механіка-матэматычны, радыёфізічны, фізічны, філалагічны, філасофскі, хімічны, эканамічны, юрыдычны. Навучанне дзённае, вячэрняе і завочнае. Ёсць аспірантура. Пры ун-це ін-т павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх навук, астр. абсерваторыя, бат. сад, вылічальны цэнтр, археал., бат., геал., заалагічны музеі, праблемныя лабараторыі, эксперым. біябаза і інш. Прымае да абароны канд. і доктарскія дысертацыі. Выдае «Вісник Київського університету», газ. «Київський університет». У 1959 узнаг. ордэнам Леніна. Іл. гл. ў арт. *Кіеў*. *М. У. Белы.* Кіеў.

КІЁТА, горад у Японіі, адм. ц. прэфектуры Кіёта. Размешчаны на в-ве Хонсю, у катлавіне Ямасіра, за 10 *км* на ПдЗ ад воз. Біва. Культ., рэліг. і прамысл. цэнтр краіны. Чыг. вузел. 1419 тыс. ж. (1970). Тэкст., швейная, харч., эл.-тэхн., авіяц. прамысловасць. Каляровая металургія, ваен. з-ды. Старадаўні цэнтр саматужнай прамысловасці (вытворчасць шаўковых, фарфоравых, бронзавых, лакіраваных, бамбукавых вырабаў). 2 універсітэты (найстарэйшыя ў Японіі), медыцынская акадэмія.

КІЖАВАТАЎ Андрэй Мітрафанавіч [7(20).8. 1907, с. Селікса Пензенскага пав.— чэрв. 1941], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1965). Чл. КПСС з 1939. Вызначыўся пры абароне Брэсцкай крэпасці. Пад камандаваннем лейтэнанта К. воіны 9-й пагранзаставы прынялі першы бой на граніцы і гераічна загінулі. Імя К. прысвоена пагранічнай заставе.

КІЖНЕРА РЭАКЦЫЯ, рэакцыя ператварэння карбанільных злучэнняў *(альдэгідаў* і *кетонаў)* у вуглевадароды пры апрацоўцы іх гідразінам і далейшым каталітычным раскладаннем утвораных гідразонаў у прысутнасці шчолачы. Адкрыта рус. хімікам М. М. Кіжнерам у 1911. Выкарыстоўваецца пераважна для вызначэння будовы карбанільных злучэнняў. К. р. з α, β-ненасычанымі альдэгідамі і кетонамі вядзе да ўтварэння піразалінаў, пры каталітычным раскладанні якіх атрымліваюць замешчаныя цыклапрапаны.

Літ.: Родионов В. М. и Ярцева Н. Г. Реакция Кижнера, у кн.: Реакции и методы исследования органических соединений, кн. 1, М.—Л., 1951; Серрей А. Справочник по органическим реакциям, пер. с англ., М., 1962.

КІЖЫ, востраў на Анежскім воз. (у Карэльскай АССР), дзе збярогся комплекс драўляных збудаванняў 18—19 ст. Кіжскага пасялішча. Яно ўпершыню ўпамінаецца ў 1556. Арх. комплекс К. складаецца з 22-галовай Праабражэнскай ц. (1714), 9-галовай Пакроўскай ц. (1764) і шатровай званіцы (1784, будаўнік С. Пятрухін). У 1960 К. ператвораны ў Музей-запаведнік нар. драўлянага дойлідства і этнаграфіі Карэльскай АССР. Сюды прывезены Лазараўская ц. Мурамскага манастыра (канец 14 ст.); капліцы з в. Лелікозера (2-я пал. 18 ст.) і Каўгара (17—19 ст.), сялянскія дамы, млыны і гасп. пабудовы. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Архітэктура* (укл. II) і *Драўлянае дойлідства*.

Літ.: Кижи — остров сокровищ. Путеводитель, Петрозаводск, 1965; Остров Кижи, Петрозаводск, 1968; Кижи, 2 изд., Л., 1970.

КІЗАТАЎ Жалел Кізатавіч (н. 9.10.1920, с. Карагай Петрапаўлаўскага пав. Акмолінскай вобл.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1942. На фронце з 1941. Вызначыўся ў Камарынскім р-не Палескай вобл. У ліку першых фарсіраваў Дняпро, разведаў варожыя агнявыя кропкі і з 28.9 да 3.10.1943 карэкціраваў агонь артылерыі. Жыве ў г. Кзыл-Арда Каз. ССР.

КІК-КАБА, рэшткі палеалітычнай стаянкі ў пячоры Кіік-Каба, за 25 *км* на У ад Сімферопаля. Даследаваў Г. А. *Бонч-Асмалоўскі* ў 1923—24. Мае 2 культурныя пласты: ніжні канца ашэльскага — пач. мусцьерскага часу і верхні сярэднемусцьерскага часу. Пры раскопках знойдзены крамянёвыя прылады працы і косці дзікіх жывёл. У К.-К. выяўлены пахаванні з рэшткамі шкілетаў неандэртальскага дарослага чалавека і дзіцяці — першыя знаходкі стараж. чалавека на тэр. СССР.

Літ.: Бонч-Осмоловский Г. А. Палеолит Крыма, в. 1—3, М.— Л., 1940—54.

КІЙ, ШЧЭК, ХАРЫЎ, легендарныя заснавальнікі Кіева. Паводле паданняў рус. летапісаў — князі палян, заснавальнікі трох паселішчаў, з якіх склаўся *Кіеў*. Існаванне паселішчаў на тэр. Кіева пацверджана археал. раскопкамі. Легенда пра К., Ш., Х. і іх сястру Лыбедзь у 8 ст. запісана ў Арменіі.

Літ.: Рыбаков Б. А. Древняя Русь. Сказания. Былины. Летописи, М., 1963.

КІЙКОЎ Аляксей Якаўлевіч (н. 17.2.1921, в. Колтык Бійскага пав. Алтайскай губ.), дзярж. дзеяч БССР. З сялян. Чл. КПСС з 1944. Скончыў Ленінградскі ін-т павышэння кваліфікацыі Мін-ва лясной гасп. СССР (1951), ВПШ пры ЦК КПСС (1960). У 1936—41 працаваў у Краснаярскім краі. З жн. 1941 на Калінінскім фронце. У 1942—49 майстар, нач. цэха, гал. інжынер на дрэваапр. прадпрыемствах Усць-Абакана, Мастоў, Барысава. З 1951 дырэктар лесакамбіната «Камінтэрн», старшыня гарвыканкома, першы сакратар гаркома КПБ у Барысаве. У 1960—62 нам. зав. аддзела прамысловасці і транспарту ЦК КПБ, з снеж. 1962 другі сакратар Магілёўскага прамысл. абкома КПБ, з снеж. 1964 нач. управлення лясной, папяровай і дрэваапр. прамысловасці Саўнаргаса БССР, з ліст. 1965 міністр лясной і дрэваапр. прамысловасці БССР. На XXV—XXVII з'ездах КПБ выбраны канд. у чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета БССР 5, 7—8-га скл. Узнаг. ордэнам Кастр. Рэвалюцыі, 2 інш. ордэнамі, медалямі.

КІКАШ Міхаіл Іванавіч (5.10.1919, с. Носаўка Нежынскага пав. Чарнігаўскай губ.— 10.10.1949), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). На фронце з 1941, камандзір стралк. роты. Вызначыўся ў Гомельскай вобл. 15.10.1943 у складзе дэсантнай групы фарсіраваў Дняпро каля Лоева, выбіў ворагаў з траншэі, захапіў вышыню, адбіў 3 контратакі праціўніка.

КІКІМАРА, жаночы вобраз усходнеславянскай дэманалогіі, шкодлівая надпрыродная істота, блізкая да *дамавіка*. Найб. уласцівая рус. нар. вераванням. У беларусаў і ўкраінцаў вядомая яшчэ пад назваю *мара*.

КІКОІН Ісак Канстанцінавіч [н. 15(28).3. 1908, мяст. Жагоры Шавельскага пав. Ковенскай губ.], савецкі фізік. Акад. АН СССР (1953, чл.-кар. 1943). Герой Сац. Працы (1952). Скончыў Ленінградскі політэхн. ін-т (1931). Працаваў у НДІ і ВНУ Ленінграда і Свярдлоўска. З 1943 у Ін-це атамнай энергіі імя Курчатава АН СССР. Асн. працы па вывучэнні эл. і магн. уласцівасцей металаў і паўправаднікоў. Выявіў гальванамагн. з'явы ў вадкіх металах. Адкрыў (з М. М. Насковым) і даследаваў фотамагнітны эфект у паўправадніках (эфект Кікоіна — Наскова), вызначыў заканамернасці для гальванамагнітных з'яў у ферамагнетыках. Распрацаваў метады вымярэння эл. велічынь пры вялікіх (дзесяткі тысяч ампер) пастаянных токах. Дзярж. прэмія СССР 1942, Ленінская прэмія 1959, Залаты медаль імя Курчатава АН СССР 1971. Узнаг. 5 ордэнамі Леніна, 2 інш. ордэнамі.



Тв.: (Разам з Я. Р. Дорфманам) Физика металлов, Л.— М., 1933; (разам з А. К. Кікоіным) Молекулярная физика, М., 1963.

Літ.: Исаак Константинович Кикоин, «Успехи физических наук», 1968, т. 94, в. 3.

КІКОІН Міхаіл Іосіфавіч [н. 2(14).8.1898, Бабруйск Мінскай губ.], удзельнік грамадз. вайны, ген.-м. інж.-тэхн. службы (1944). З сям'і рыбака. Чл. КПСС з 1941. Скончыў 1-я Сав. камандныя артыл. курсы (1919), Артыл. акадэмію імя Дзяржынскага (1934). У арміі з лютага 1917, у Чырв. Арміі з ліст. 1918. У 1919—21 на Зах. фронце — нач. разведкі і сувязі батарэі, дывізіёна, нач. штаба дывізіёна. Удзельнік баёў у р-нах Віцебска, Полацка, Маладзечна, Ліды, Гродна. З 1935 старшы ваен. прадстаўнік, памочнік старшыні артылерыйскага к-та. З 1954 у адстаўцы. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 5 інш. ордэнамі, медалямі. Жыве ў Маскве.

КІЛА, хвароба, тое, што *ерыжа*.

КІЛА КРЫЖАКВЕТНЫХ, хвароба каранёў раслін сям. крыжакветных — капусты, бручкі, радыскі, рэпы, рэдзькі, турнэпсу. Найб. шкодзіць раслінам на кіслых глебах. Узбуджальнік—грыб Plasmodiophora brassicae, псуе карані, утвараючы на іх вялікія патаўшчэнні.



Кіла капусты.

Раслінам не хапае вады, яны дрэнна растуць, лісце жаўцее. Качаны капусты, караняплоды дробныя або зусім не ўтвараюцца. Увосень патаўшчэнні на каранях загніваюць, распадаюцца, вызваляючы вял. колькасць спораў паразіта, які зімуюць у глебе. Глеба становіцца крыніцай заражэння на 4—5 гадоў. Меры барацьбы: пасадка здаровай расады, вырошчванне капусты ў севазвароце, культываванне ўстойлівых сартоў, вапнаванне кіслых глебаў, перыядычная замена глебы ў парніках, знішчэнне хворых качаноў.

Літ.: Герасимов В. А. и Осницкая Е. А. Вредители и болезни овощных культур. 4 изд., М., 1961. *З. І. Рамнёва.* Самахвалавічы, Мінскі раён.

КІЛАГРАМ, асн. адзінка масы ў *міжнароднай сістэме адзінак*, роўная масе міжнар. прататыпу кілаграма. Абазначаецца *кг* ці kg. Прататып К.— зроблена ў 1799 плацінавая цыліндрычная гіра з вышынёй, роўнай дыяметру; зберагаецца ў Нац. архіве Францыі. Эталон К. ў СССР — плаціна-ірыдыевая гіра № 12, зберагаецца ва Усесаюзным НДІ метралогіі імя Мендзялеева ў Ленінградзе. Яе маса (паводле вымярэння 1948) роўная 1 *кг*+0,085 *мг*.

КІЛАГРАМ-МАЛЕКУЛА (кіламоль), колькасць рэчыва, выражаная ў *кг*, лікава роўная адноснай малекулярнай масе гэтага рэчыва. Абазначаецца *кг-мал*. Напр., маса 1 *кг-мал* вадароду роўна 2,016 *кг*, вады — 18,015 *кг*. К.-м. ўсіх рэчываў змяшчае ў сабе аднолькавы лік (6,0229 . 10^{26}) малекул. Умоўна можна вызначыць К.-м. сумесі рэчываў. Напр., 1 *кг-мал* паветра прымаецца роўнай 29 *кг*. Выкарыстоўваецца ў фізічнай хіміі і хімічнай тэрмадынаміцы. Гл. таксама *Авагадра закон*.

КІЛЕВЫЯ ПТУШКІ, кіляградыя (Volantes), надатрад птушак. Уключае большасць сучасных птушак. Усяго каля 35 атр.: *курыныя, голубы, чайкі, гагары, гусепадобныя, зязюлі, дзятлы, вераб'іныя, весланогія, журавлі, дрофы, паганкі* і інш. 8500 відаў. Пашыраны ва ўсім свеце.

К. п. маюць кіль (грэбень на грудной косці для прымацавання грудных мышцаў) і напоўненыя паветрам косці. У адрозненне ад бяскілевых птушак добра лятаюць (акрамя некат. пастушковых, якія страцілі гэтую здольнасць).

Літ.: Руководство по зоологии, т. 6. М.— Л., 1940; Гладков Н. А. Биологические основы полета птиц (Материалы к познанию фауны и флоры СССР, в. 18), М., 1949; Птицы Советского Союза, т. 1—6, М., 1951—54.

КІЛЬКІ, агульная назва дробных прамысл. рыб сям. селядцовых. Гл. ў арт. *Цюлькі, Шпроты*.

КІЛЬСКІ КАНАЛ (Kieler Kanal, Nordostseekanal), марскі канал паміж Кільскай бухтай (Балтыйскае м.) і вусцем Эльбы (Паўночнае м.). Пабудаваны ў 1887—95. Праходзіць па тэр. ФРГ, мае міжнар. статус. Даўж. 98,7 *км*, шырыня па дне 44, па паверхні 102 *м* (ёсць расшырэнні, каб размінуцца сустрэчным вялікім суднам), глыбіня 11,3 *м*. К. к. скарачае шлях з Балтыйскага ў Паўночнае мора на 685 *км*.

КІМ, гл. *Камуністычны Інтэрнацыянал Моладзі*.

КІМ Аляксей Харытонавіч [н. 9(22).11.1914, в. Сінтухінка Ханкайскага р-на Далёкаўсходняга краю], беларускі савецкі вучоны ў галіне тэарэт. механікі. Д-р тэхн. н., праф. (1967). Чл. КПСС з 1953. Скончыў Маскоўскі тарфяны ін-т (1937). З 1953 выкладчык, з 1963 заг. кафедры тэарэт. механікі, з 1968 адначасова дэкан машынабуд. ф-та Бел. політэхн. ін-та. Навук. працы ў галіне рэалогіі вязка-пластычных дысперсных сістэм.

Тв.: Некоторые вопросы реологии вязко-пластичных дисперсных систем, Мн., 1960; (разам з В. І. Лапушынай) Обобщенное уравнение стационарного изотермического течения нелинейно-вязкопластичной среды в цилиндре произвольного сечения, «Весці АН БССР. Сер. фізіка-энергетычных навук», 1969, № 4.

КІМАНО, японскае нац. мужчынскае і жаночае адзенне з шырокімі рукавамі; крыссе захінаецца злева направа. Рукавы ўнізе пашыты накшталт кішэняў. Жанчыны носяць К. з шырокім поясам.

КІМАНТ-ЯЦЫНА Марцаліна Іванаўна [14(26).4.1884, Пецярбург — 3.5.1961], руская і польская піяністка і педагог. Скончыла Петраградскую кансерваторыю (1907). Праф. Пецярбургскай (1915—22) і Варшаўскай (1931—39 і 1946—55) кансерваторый (сярод вучняў бел. кампазітар Э. Тырманд). Удзельнічала ў рабоце *Беларускага музычна-драматычнага гуртка* ў Вільні. У 1914 напісала музыку аперэты «Залёты» на тэкст В. Дуніна-Марцінкевіча, кіравала муз. часткай пастаноўкі.

КІМБАР Іосіф Канстанцінавіч [н. 3(16).9.1905, Мінск], генерал-лейтэнант танкавых войск (1945). З рабочых. Чл. КПСС з 1932. Скончыў Ваен. акадэмію бранятанкавых войск (1937). У Чырв. Арміі з 1921. У 1938—40 нач. бранятанкавай службы дывізіі, нач. штаба брыгады і дывізіі. У Айч. вайну на Зах., 1-м Бел. і 1-м Укр. франтах — нач. штаба брыгады, дывізіі, камандзір корпуса, нам. камандуючага арміі. У 1946—61 камандуючы бранятанкавых і механізаваных войск ваен. акругі, 1-ы нам. нач. Цэнтр. афіцэрскіх курсаў «Выстрал». З 1961 у запасе. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 5 іншымі ордэнамі, медалямі, 3 ордэнамі ПНР. Жыве ў Маскве.



КІМБЕРГ Якаў Мікалаевіч [н. 3(16).12.1909, Адэса], рускі савецкі акцёр. Нар. арт. БССР (1967). Скончыў драм. курсы пры кінастудыі «Масфільм» (1937). У 1930—37, 1941—46 у Сав. Арміі. Працаваў у Бабруйскім калг.-саўг. т-ры (1938—41), Бабруйскім абл. драм. т-ры (1946—47), з 1947 у Гродзенскім драм. т-ры. Мастацтву К. ўласцівыя жыццёвая верагоднасць, мяккі гумар, дакладны псіхал. малюнак. Ролі: Аркашка, Шмага («Лес», «Без віны вінаватыя» А. Астроўскага), Шальменка («Шальменка-дзяншчык» Р. Квіткі-Аснаўяненкі), Манахаў («Варвары» М. Горкага), Мітрыч («Улада цемры» Л. Талстога), Чабутыкін («Тры сястры» А. Чэхава), адмірал Макараў («Порт-Артур» паводле А. Сцяпанава), Цыплянкоў («Перабежчык» А. і П. Тур), Новікаў («Палата» С. Алёшына), Каляда («Год здзяйснення» П. Васілеўскага), Шыковіч («Сэрца на далоні» паводле І. Шамякіна), Цярэшка («Трыбунал» А. Макаёнка). Выканаў ролі У. І. Леніна («Паміж ліўнямі» А. Штэйна) і Карла Маркса («Дачка Расіі» П. Чарадніченкі). Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі. *А. А. Лабовіч.* Мінск.





Я. М. Кімберг у ролі Цыплянкова (злева). Сцэна са спектакля.

КІМБЕРЛІТ (ад г. Кімберлі ў ПАР, дзе выяўлены ў 1879), вывергнутая ультрасіл. горная парода, якая часта змяшчае алмазы. Складзена пераважна з алівіну, піраксенаў, слюды, магнетыту, гранату (піропу). Структура брэкчыяпадобная. Колер чорны з сіняватым і зеленаватым адценнем, пры змене пераходзіць у жоўтую і сіняю гліністую пароду. Запаўняе кімберлітавыя трубкі круглаватай формы (т. зв. трубкі выбуху). Выяўлены ў СССР (Якуція), у Паўд. Афрыцы, Паўд. Амерыцы, Індыі.

Літ.: Трофимов В. С. Основные закономерности размещения и образования алмазных месторождений на древних платформах и в геосинклинальных областях. М., 1967.

КІМЕРЫДЖСКІ ВЕК (ЯРУС) (кімерыдж), позні век позняй эпохі (верхні ярус верхняга аддзела) *юрскага перыяду (сістэмы)*. Вылучаны франц. даследчыкам Ж. Турманам каля зал. Кімерыдж у Вялікабрытаніі ў 1843. Адклады К. я. ў межах Усх.-Еўрап. платформы складзены пераважна з карбанатных парод. На Беларусі не выяўлены.

КІМЕРЫЙСКАЯ СКЛАДКАВАСЦЬ, складкавыя працэсы, якія адбыліся на Зямлі ў сярэдзіне *мезазойскай эры*. Вылучаюць старажытнакімерыйскую (канец трыясу — пачатак юры) і новакімерыйскую (канец юры — пачатак мелу) фазы. Першая адбылася на Каўказе, у Крыме, Усх. Карпатах, у гэты ж час падзялілася *Гандвана*, развіўся магутны вулканізм у Афрыцы і Паўд. Амерыцы. Другая вызначыла асн. структурныя асаблівасці Усх. Азіі (Верхаянскае, Забайкалле, Кітай, Індакітай) і Паўн. Амерыкі ўздоўж Ціхаакіянскага ўзбярэжжа (Аляска, Каскадныя горы).

КІМЕРЫЙЦЫ (грэч. Kimmérioi), назва плямёнаў, якія ў 7—6 ст. да н. э. жылі ў Паўн. Прычарнамор'і. Упершыню ўпамінаюцца ў Гамера, Каліна і Герадота. Былі выцеснены *скіфамі*, захапілі Фрыгію, Лідыю, Кападокію. Іх знаходжанне ў Паўн. Прычарнамор'і адлюстравана ў стараж. тапаніміцы — Баспор Кімерыйскі, Кімерыйскі вал і інш.

Літ.: Терепожкин А. И. Киммерийцы, М., 1964.

КІМ ІР СЕН (н. 15.4.1912, в. Мангёндэ, каля Пхеньяна), дзеяч карэйскага і міжнароднага камуніст. і рабочага руху, дзярж. дзеяч КНДР. З сялян. У 1924 бацька К. І. С. з сям'ёю эміграваў у Кітай з-за праследаванняў яп. калан. улад. У эміграцыі К. І. С. уключыўся ў рэвалюц. дзейнасць. У 1931 уступіў у кампартыю Кітая. У 1932 арганізаваў карэйскі партыз. атрад, які вырас у кар. народна-рэвалюц. армію. Пад камандаваннем К. І. С. армія разам з кіт. народна-рэвалюц. сіламі вяла супраць яп. захопнікаў на тэр. Паўн.-Усх. Кітая і Паўн. Карэі. У снеж. 1945 К. І. С. выбраны 1-м сакратаром паўн.-кар. Аргбюро кампартыі Карэі, у лютым 1946 старшынёй Часовага нар. к-та Паўн. Карэі, у лютым 1947 старшынёй Нар. к-та Паўн. Карэі, у вер. 1948 старшынёй Кабінета міністраў КНДР. З 1949 (пасля зліцця Працоўнай партыі Поўначы і Поўдня ў адзіную партыю) К. І. С. старшыня ЦК Працоўнай партыі Карэі (з 1966 ген. сакратар). Маршал КНДР (1953). Герой КНДР (1953), Герой Працы КНДР (1958).

Тв.: Рус. пер.— Избр. ст. и речи, М., 1962.

КІМІЯ, вёска ў Зембінскім с/с Барысаўскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса імя Леніна. За 33 *км* на ПнЗ ад Барысава, 80 *км* ад Мінска, 38 *км* ад чыг. ст. Барысаў, на аўтамаб. дарозе Барысаў — Бягомль. 348 ж., гасп. 121 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, магазін. У вер. 1943 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі.

Каля К. гарадзішча *штрыхаванай керамікі культуры* (3—1 ст. да н. э.). З У ўмацавана валам і ровам. Даследавалася А. М. Лялўданскім (1931) і А. Р. Мітрафанавым (1950). Пры раскопках знойдзены жал. і касцяныя прылады працы, жал. і бронзавыя ўпрыгожанні, гліняныя прасліцы, каменныя зерняцёркі, крыцы; выяўлены рэшткі печы-домніцы і жытлаў слупавой канструкцыі. Посуд штрыхаваны і ёсць посуд, падобны на керамі-ку *мілаградскай культуры*.

Літ.: Очерки по археологии Белоруссии, ч. 1, Мн., 1970.

КІМУНДРЫС Аляксандр Георгіевіч (5.3. 1892, Адэса — 1937), удзельнік грамадз. вайны на Беларусі, узнаг. 2 ордэнамі Чырв. Сцяга; камбрыг (1935). З рабочых. Чл. КПСС з 1918. Скончыў вышэйшыя акадэмічныя курсы РСЧА (1922). Удзельнік 1-й сусв. вайны. У Кастр. рэв. на Румынскім фронце старшыня палкавога к-та. У грамадз. вайну на Зах. фронце — камандзір, камісар палка, брыгады, камандзір брыгады 2-й стралк. дывізіі. Вызначыўся 9.7.1920 пры фарсіраванні Бярэзіны каля мяст. Свіслач і 31.7—4.8.1920 пры штурме фартоў Брэсцкай крэпасці і фарсіраванні Бу-га. Пасля грамадз. вайны камандзір брыгады, дывізіі, ваен. кіраўнік у навуч. установах.

КІН (Кеан) Эдмунд (17.3.1787, Лондан — 15.5.1833), англійскі акцёр. Вядомы прадстаўнік рамантызму. У 1814 дэбютаваў на лонданскай сцэне. Лепшыя ролі — у шэкспіраўскім рэпертуары. Сярод іх: Шэйлак («Венецыянскі купец»), Атэла, Гамлет, Макбет, Рычард III, Рычард II (аднайм. п'есы). Мастацтва К. высока ацэньвалася прагрэс. дэмакр. крытыкай, у т. л. Дж. Байранам і Г. Гейнэ. Акцёру ўласцівыя яркі сцэн. тэмперамент, экспрэсіўнасць, псіхал. паглыбленасць.

Літ.: Минц Н. Эдмунд Кин. Очерк жизни и творчества, М., 1957.

КІНА... (ад грэч. kinéō рухаю), пачатковая частка складаных слоў, якая паказвае на іх адносіны да кінематаграфіі (напр., *кінастудыя, кінаэкран*).

КІНАВАР (ртутная падманка), мінерал, сульфід ртуці HgS. Гал. руда на ртуць, выкарыстоўваюць і як чырвоную фарбу.

Змяшчае 86,2% Hg. Крышталізуецца ў трыганальнай сістэме. Трапляецца найчасцей ва ўкрапленніках, суцэльных зярністых масах ці ў парашкападобных прымазках і налётах. Колер чырвоны. Бляск алмазны. Цв. 2—2,5; шчыльн. 8090—8200 *кг/м*³. Крохкая. Паходжанне гідратэрмальнае. Радовішчы ў СССР (Сярэдняя Азія, Зах. Сібір, Украіна), Іспаніі, Італіі, Югаславіі, Канадзе, ЗША.

КІНАЗДЫМАЧНЫ АПАРАТ, оптыка-механічная прылада для здымкі кінафільмаў *(кіназдымкі)*.

Паводле прызначэння К. а. падзяляюцца на 5 асн. груп: сінхронныя, агульнага прызначэння, прэцызійныя, скарасныя, ручныя. Сінхронныя К. а. прызначаны для здымкі выяў сінхронна з запісам гукаў на асобную плёнку. Бываюць 2 варыянтаў: для здымкі ў павільёнах і на натуры. К. а. агульнага прызначэння — найб. пашыраны тып кіназдымачнай апаратуры, які выкарыстоўваецца пры несінхроннай здымцы ў павільёнах і на натуры. К. а. з сінхроннымі электрарухавікамі ўжываюцца пры здымцы з наступным агучваннем і пад загадзя запісаную фанаграму. Прэцызійныя К. а. прызначаны для камбінаванай, мультыплікацыйнай і інш. спец. кіназдымкі, дзе патрабуецца дакладнасць сумяшчэння элементаў выявы. Скарасныя К. а. выкарыстоўваюцца для здымкі са значна павышанай частатой кадраў, якая патрабуецца, калі здымаюць спарт. спаборніцтвы, хуткія вытв. працэсы і інш. Ручныя К. а.— аснаватып апаратуры для хранікальна-дакументальнай кіназдымкі, навук.-папулярных, навучальных і некат. сцэн мастацкіх фільмаў. Для здымкі звычайных і шырокаэкранных фільмаў вы карыстоўваюцца К. а. з 35-*мм* кінаплёнкай (шырокаэкранныя фільмы здымаюцца К. а. з анаморфотнай оптыкай), шырокафарматныя — з 70-*мм* кінаплёнкай. Ёсць таксама спецыялізаваныя К. а.— агрэгаты з трох К. а. для здымкі панарамных фільмаў, агрэгаты з 11 К. а. для кругарамных фільмаў, розных даследчых кіназдымак і інш. Асобная група — аматарскія К. а., якімі здымаюць на кінаплёнцы 16 *мм*, 2×8 *мм* і 8 *мм*.



Кіназдымачны апарат «Расія» для сінхроннай здымкі.

Літ.: Гребенников О. Ф. Киносъемочная аппаратура, Л., 1971; Толчан Я. М. Киносъемочная аппаратура. М., 1968. *В. А. Папоў*. Мінск.

КІНАЗДЫМКА, бесперапыннае фатаграфаванне на *кінаплёнку* шэрагу паслядоўных кадраў, якія адлюстроўваюць фазы руху аб'екта ці змену яго стану. Робіцца *кіназдымачным апаратам*.

Падзяляецца на сінхронную і нямую. Сінхронная робіцца адначасова з гуказапісам, нямая — з наступным агучваннем, без яго ці пад загадзя запісаную фанаграму. Адрозніваюць К. пакадравую, запаволеную (менш як 24 кадры за *сек*), нармальную (24—25), паскораную (да 120—150), скорасную (да 750—1000) і высакаскорасную (больш за 1000 кадраў за *сек*). Да спец. відаў К. адносіцца камбінаваная, падводная, люмінесцэнтная, мікра-, рэнтгена-, стэрэакіназдымка. К. ў інфрачырвоных і ультрафіялетавых прамянях. Паводле пазіцыі кіназдымачнай камеры ў час здымкі адрозніваюць К. статычную, дынамічную і панарамную (паварочванне камеры ў гарыз. і верт. плоскасці). Паводле месца выканання К. бывае павільённая, якая вядзецца на кінастудыі, і натурная.

КІНАЗНАЎСТВА, галіна мастацтвазнаўства, якая даследуе кіно як мастацтва, сродак асветы і інфармацыі. Уключае тэорыю, гісторыю і крытыку *кінамастацтва*, распрацоўвае праблемы кінадраматургіі, рэжысуры, акцёрскай творчасці, выяўленчага вырашэння фільма, пытанні гістар. развіцця кінематаграфіі, маст. плыняў. У К. ўваходзяць яшчэ галіны канкрэтнай сацыялогіі і псіхалогіі, якія вывучаюць заканамернасці ўспрымання фільма і яго ўздзеяння на аўдыторыю.

К. ўзнікла ў 20-я г. 20 ст. Сярод буйных замежных кіназнаўцаў — Л. Дэлюк, Р. Клер, Ж. Садуль (Францыя), Ч. Дзаваціні, Л. К'ярыні, К. Лідзані (Італія), П. Рота, Р. Мэнвел, А. Монтэгю (Англія), Дж. Х. Лоўсан (ЗША), Е. Тэпліц (Польшча), Б. Балаш (Венгрыя). Сав. К. асвятляе праблемы кінамастацтва з пазіцый марксісцка-ленінскай эстэтыкі, апіраючыся на навук.-тэарэт. дасягненні сав. мастацтвазнаўства, садзейнічае развіццю метаду сац. рэалізму. У аснове сав. К.— выказванні У. І. Леніна пра кіно як найважнейшую галіну сацыяліст. культуры. Значны ўклад у развіццё сав. К. зрабілі: А. Луначарскі, Дз. Вертаў, С. Гінзбург, Н. Зархі, Л. Куляшоў, М. Лебедзеў, А. Піятроўскі, У. Пудоўкін, В. Туркін, В. Шклоўскі, С. Эйзенштэйн, Р. Юрэнеў, С. Юткевіч. У 1945 ва Усесаюзным ін-це кінематаграфіі створана кіназнаўчае аддз. Потым у ін-це гісторыі мастацтваў АН СССР адкрыўся кінасектар на чале з Эйзенштэйнам. На Беларусі ў 1957 створаны сектар т-ра і кіно ў Ін-це мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Бел. кіназнаўцы: А. Красінскі, В. Нячай, Г. Падбярэзскі, Г. Ратнікаў, В. Смаль, Е. Бондарава.

Літ.: Бондарева Е. Л., В. В. Корш-Саблин, Мн., 1960; Красинский А. В., Тарасевич Г. П. и Смаль В. И. Кинопскусство Советской Белоруссии, Мн., 1961; Красінскі А. В., Смаль В. І. і Тарасевіч Г. П. Беларускае кіно. Кароткі нарыс, Мн., 1962; Проблемы современного белорусского искусства, Мн., 1968; История белорусского кино, ч. 1—2, Мн., 1969—70; Бондарева Е. Л. и Шилова Л. Ф. Очерк на экране, Мн., 1969; Смаль В. И. Искусство быть кинозрителем, Мн., 1968; Нечай О. Ф. Экран и мы, Мн., 1971; Красинский А. В. Юрий Тарич, Мн., 1971; гл. таксама літ. пры арт. *Кінамастацтва*. *Е. Л. Бондарава*. Мінск.

КІНАКАМЕДЫЯ, жанр кінамастацтва, адметнымі асаблівасцямі твораў якога з'яўляецца паказ камедыйных характараў і сітуацый. Мае разнавіднасці: лірычная, сатырычная, эксцэнтрычная, фантаст. К., кінавадэвіль.

Першая К.— «Паліты палівальшчык» (1895, рэж. Л. Люм'ер). Распрацоўка жанру К. звязана з дзейнасцю прадстаўнікоў т. зв. франц. камічнай школы (Ж. Мельес, М. Ліндэр, Р. Клер) і амерыканскай (М. Сенет, Э. Любіч, Ф. Капра, У. Уайлер і асабліва Ч. Чаплін, які аб'яднаў эксцэнтрыку з лірыка-рамант. і трагікамічнымі элементамі). Пасля 2-й сусв. вайны ўзмацніліся сац.-грамадскія матывы. К. належыць значнае месца ў сав. кіно. Характэрныя яе рысы — пастаноўка грамадскіх праблем, жыццёвасць сітуацый і характараў.



Кадр з кінакамедыі «Нашы суседзі». 1957.

У 20-я г. створаны першыя сав. К.: «Цудатворац» (1922, рэж. А. Панцялееў), «Свята св. Іоргена» (1930, Я. Пратазанаў) і інш. У 30—40-я г. ў жанры К. працуюць рэжысёры Р. Аляксандраў («Вясёлыя хлопцы», 1934; «Цырк», 1936; «Волга-Волга», 1938) і І. Пыр'еў («Трактарысты», 1939; «Свінарка і пастух», 1941), у 50—60-я г.— Э. Разанаў («Карнавальная ноч», 1956; «Сцеражыся аўтамабіля», 1966), Л. Гайдай («Аперацыя «Ы» і іншыя прыгоды Шурыка», 1965) і інш.

Сярод бел. К.: «Паручнік Кіжэ» (1934, А. Файнцымер), «Дзяўчына спяшаецца на спатканне» (1936, М. Вернер), «Шукальнікі шчасця» і «Маё каханне» (1936, 1940, У. Корш-Саблін), «Маска» і «Мянтуз», «Нашы суседзі» (1938, 1957, С. Сплашноў), «Мядзведзь» і «Чалавек у футарале» (1938, 1939, І. Анепскі), «Несцерка» (1955, А. Зархі); фільмы-спектаклі «Паўлінка» (1952, Зархі), «Пяюць жаваранкі» (1953, Корш-Саблін і К. Саннікаў), «Хто смяецца апошнім» (1954, Корш-Саблін).

Літ.: Юренев Р. Н. Советская кинокомедия, М., 1964; Ягло Ж. Смешное на экране, М., 1964; История белорусского кино, ч. 1—2, Мн., 1969—70. *Е. Л. Бондарава*. Мінск.

КІНАКАПІРАВАЛЬНЫ АПАРАТ, оптыка-механічная прылада для друкавання копій з кінавыяў *(контратыпавання)*.

Адрозніваюць К. а. з кантактавым і аптычным спосабамі друкавання. Пры першым спосабе ў час экспазіцыі негатыўная і пазітыўная плёнкі шчыльна прыціскаюцца адна да адной эмульсійнымі слаямі, пры другім — знаходзяцца на адлегласці, і выява праектуецца праз аптычную сістэму. Падзяляюцца на К. а. з бесперапынным і перапынным друкаваннем. К. а. для каляровага друку бываюць адтыўныя, заснаваныя на прынцыпе спектральнага раскладання светлавога патоку, і субтрактыўныя — пры друку выкарыстоўваецца набор святлофільтраў для карэкцыі. Асн. вузлы К. а.: стужкапратяжны механізм, святлоаптычная сістэма, пашпартны механізм для кантролю за святлом і колерам пры друкаванні. К. а. дае магчымасць сінхронна сумяшчаць на кінаплёнцы выяву і фанаграму.



Кінакапіравальны апарат 23РТО-1.

КІНАМАСТАЦТВА, род мастацтва, які ўзнік на тэхнічнай базе *кінематаграфіі* і аб'ядноўвае ў сабе магчымасці прасторавых і часавых мастацтваў. Творы К. (*кінафільмы*) — вынік калект. творчасці кінадраматурга, рэжысёра, акцёраў, аператара, мастака, кампазітара і інш. К. сінтэзуе маст. магчымасці л-ры, т-ра, жывапісу, музыкі з уласнымі сродкамі выразнасці, непарыўна звязана з развіццём кінатэхнікі. Асн. сродкі выразнасці — *мантаж* (творчы працэс спалучэння знятых паасобку кінакадраў) і фатаграфічная прырода кінавыявы. Вял. значэнне мае таксама план (буйны, сярэдні, агульны), якім рэжысёр ажыццяўляе трактоўку эпізода, фарміруе рытм дзеяння. Склаліся 4 асн. віды К.: мастацкае (ігравое) кіно, якое сродкамі выканаўчай творчасці ўвасабляе напісаныя для пастаноўкі літ. сцэнарыі або адаптаваныя творы л-ры і драматургіі; *дакументальнае кіно*, якое непасрэдна фіксуе на плёнку рэальную рэчаіснасць; *мультыплікацыйнае кіно* — пакадравая здымка паслядоўных фазаў рухаў графічных або аб'ёмных персанажаў; *гукавое кіно* — карыстаецца сродкамі і магчымасцямі папярэдніх відаў, каб пашырыць навук. веды. Жанры К., дакладна размежаваныя на ранняй стадыі існавання кіно (драма, меладрама, камедыя, вестэрн, дэтэктыўны, муз. фільм і інш.), з эвалюцыяй яго відазмяняюцца — спалучаюцца, узаемапранікаюць або распадаюцца. Кінематаграфічны вобраз паяўляецца на экране ў шматгранным характары абагульненняў: эрокавых і выяўленчых (кампазіцыя, ракурс, планы, асвятленне, колер), гукавых (слова, дыялог, шумы, музыка), якія аб'ядноўваюцца ў адзіны мантажна-драматургічны лад фільма. Багацце і разнастайнасць маст. мовы К. даюць магчымасць шырока, у канкрэтнай форме адлюстроўваць рэчаіснасць. Магчымасць выражаць любую колькасць экз. кожнага фільма, а таксама дэманстраваць яго адначасова многім гледачам забяспечвае масавасць К. Выразныя сродкі і пазнавальныя магчымасці К. ў спалучэнні з масавасцю вызначаюць месца кіно

сярод інш. відаў мастацтва. У гутарцы з А. Луначарскім У. І. Ленін адзначыў, што «...з усіх мастацтваў для нас найважнейшым з'яўляецца кіно» (Ленин В. И. О литературе и искусстве, М., 1969, с. 685).

Гісторыю развіцця К. ўмоўна падзяляюць на 4 перыяды. 1-ы — ад вынаходства кінематографа братамі Л. і А. Люм'ер (1895) да заканчэння 1-й сусв. вайны. Манапалізацыя кінапрамысловасці (да 1906) падпарадкавала К. мяшчанскім бурж. густам. Кінарэпертуар вызначаўся прадукцыяй буйных манапаліст. фірмаў. Дасягнуты асобныя маст. поспехі (фільмы Д. Грыфіта ў ЗША, Ж. Мельеса ў Францыі, кінематаграфістаў т. зв. «брайтанскай школы» ў Англіі). 2-і перыяд — 20-я г., калі «нямое кіно» сфарміравалася як самастойнае мастацтва. У краінах з развітай кінематаграфіяй вылілася пошукі спецыфікі К. Паявіўся шэраг выдатных кінатвораў: у СССР «Браняносец «Пацёмкін» і «Кастрычнік» С. Эйзенштэйна (1925, 1927), «Кроч, Савет!» і «Шостая частка свету» Дз. Вертава (1926), «Маці» і «Канец Санкт-Пецярбурга» У. Пудоўкіна (1926, 1927), «Эліса» М. Шэнгелая (1928), «Арсенал» А. Даўжэнкі (1929) і інш., якія зрабілі ўплыў на сусв. прагрэс. К. Значныя з'явы ў К. інш. краін — у Францыі дзейнасць кінагрупы «Авангард», пастаноўка фільма «Пасіі Жанны д'Арк» (1927, рэж. К. Т. Дрэер); у Германіі — кірунак экспрэсіянізму (Р. Вінэ, П. Лені і інш.), рэаліст. творы Г. В. Пабста, Ф. В. Мурнаў, спробы стварыць пралет. кіно — П. Ютцы і інш. У ЗША асн. патоку рэакцыйнай або камерцыйнай прадукцыі Галівуда процістаялі фільмы рэжысёраў Ч. Чаплінa, Э. Штрогейма, К. Відара, прасякнутыя сац.-крытычнымі тэндэнцыямі, творчасць рэж.-дакументаліста Р. Флаэрці. У 30-я г. з паяўленнем гукавога кіно настаў 3-і перыяд у сусв. К. Узнікненне гукавога кіно супала з эканам. крызісам 1929—33, які ахапіў усе капіталіст. краіны, і ўзмацненнем прагрэс. тэндэнцый сярод маст. інтэлігенцыі. Рэаліст. кірунак у амер. кіно развівалі рэжысёры Чаплін, Відар, У. Дысней, У. Дытэрле, Ф. Капра, Ф. Ланг, У. Уайлер, О. Уэлс, Дж. Форд; у Францыі — Р. Клер, М. Карнэ, Ж. Рэнуар, Ж. Фейдэр. Гэтыя з'явы характарызавалі і развіццё нім. кіно да фаш. перавароту (Пабст, З. Дудаў і інш.). У англ. кінематаграфіі вял. поспехаў дасягнула дакумент. кіно (Дж. Грырсан і інш.), таксама вылучаліся фільмы рэжысёраў А. Корда, А. Хічкака.

У СССР развіццё К. вызначылася поспехамі будаўніцтва сацыялізма. Створаны выдатны фільм «Чапаеў» братоў Васільевых (1934), фільмы «Зямля» Даўжэнкі (1930), «Пуцёўка ў жыццё» М. Эка (1931), «Сустрэчны» Ф. Эрмлера і С. Юткевіча (1932), «Мы з Краштата» Я. Дзігана (1936), трылогія Р. Козінцава і Л. Траўберга «Юнацтва Максіма», «Вяртанне Максіма», «Выбаргская старана» (1935, 1937, 1939), «Сямёра смелых», «Настаўнік» (1936, 1939) С. Герасімава, «Дэпутат Балтыкі», «Член урада» А. Зархі і І. Хейфіца (1937, 1940), у якіх адлюстраваны найважнейшыя з'явы сав. рэчаіснасці, паказаны простыя сав. людзі. У фільмах «Ленін у Кастрычніку» і «Ленін у 1918 годзе» М. Рома (1937, 1939) і «Чалавек з ружжом» Юткевіча (1938) вобраз правадыра рэвалюцыі ў выкананні Б. Шчукіна і М. Штраўха стаў вял. дасягненнем акцёрскага мастацтва. У Айч. вайну гераічная барацьба сав. народа адлюстравана ў дакумент. фільмах Л. Варламава, Даўжэнкі, І. Капаліна, Ю. Сонцавай, Ю. Райзмана, у маст. стужках М. Данскога, І. Пыр'ева, А. Рома, Эрмлера. У 2-й пал. 40 — 1-й пал. 50-х г. у розных краінах пачаўся 4-ы, сучасны перыяд развіцця К. Адна з найважнейшых рысаў сав. кіно — новы падыход да распрацоўкі сац. праблематыкі праз аналіз характараў герояў, дакладнае даследаванне ўзаемаадносін паміж людзьмі. Гэта выявілася ў фільмах Герасімава, Даўжэнкі, В. Жалакявічуса, М. Калатозава, Л. Куліджанава, Г. Панфілава, Райзмана, С. Растоцкага. М. Рома. А. Салтыкова, Р. Чхеідзе і інш. Значнымі фільмамі сталі экранізацыі рэжысёраў С. Бандарчука, Р. Козінцава, С. Параджанава, Р. Рашаля, С. Самсонава, Хейфіца, Юткевіча і інш. У дакумент. і навук. кіно рысы новага ўласцівыя фільмам Р. Грыгор'ева, Р. Кармэна, В. Лісаковіча, Ф. Цяпкіна і інш. Найб. значная з'ява пасляваен. К.— узнікненне прагрэс. кірунку *неарэалізму* ў італьян. кіно (рэжысёры А. Блазеці, А. Вергана, Л. Вісконці, П. Джэрмі, Дж. Дэ Сантыс, В. Дэ Сіка, А. Латуада, Р. Раселіні, сцэнарыст Ч. Дзаваціні і інш.). Дасягнуты першыя значныя поспехі ў К. Польшчы (рэжысёры А. Мунк, А. Вайда, Е. Каваляровіч, В. Хас), Чэхаславакіі (М. Фрыч, І. Вейс, О. Ваўра, І. Трнка, К. Земан), ГДР (К. Метцыг, З. Дудаў, Ф. Беер, К. Вольф, Г. Райш, Анелі і Андрэ Торндайкі), Венгрыі (М. Келеці, К. Мак, Ф. Марыяшы, І. Саба, З. Фабры), Балгарыі (Р. Вылчанаў, Т. Даінаў, Д. Дакоўскі, В. Жалязкава, З. Жандаў), Румыніі (А. Блаер, М. Дрэган, І. Папеску-Гопа, Л. Чулей), Югаславіі (Д. Вукаціч, В. Міміца, А. Петравіч). Фільмы, якія рэалістычна паказваюць жыццё народа, адзначаныя пошукамі нац. своеасаблівасцей, паявіліся ў Індыі, Мексіцы, Бразіліі, Аргенціне; спрыяльныя ўмовы створаны для развіцця кінематаграфіі ў Паўн. Карэі, на Кубе і інш., пачало развівацца К. у краінах Афрыкі. У шэрагу капіталіст. краін яно вызначаецца зваротам да тэматыкі, звязанай з удзелам у Руху Супраціўлення (Францыя, Данія, Грэцыя), выкрыццём рэакц. сутнасці фаш. рэжыму (Г. Кёйтнер, В. Штаўдтэ, Б. Вікі, К. Гофман — ФРГ, Х. А. Бардэм, Л. Г. Берланга — Іспанія). Значная сац.-крытычная, прагрэс. грамадская тэматыка — у цэнтры фільмаў перадавых англійскіх (Л. Андэрсан, Т. Рычардсан, К. Рэйс), амер. (С. Крамер, М. Робсан, Ф. Цынеман) і японскіх рэжысёраў (Т. Імаі, К. Сіпда, С. Ямамота). Складаныя маральна-этычныя праблемы даследуюць розныя па сваёй творчай індывідуальнасці рэжысёры А. Курасава (Японія), Л. Бюнюэль (Іспанія), Ф. Феліні, М. Антаніёні (Італія), І. Бергман (Швецыя). Абнаўленню выразных сродкаў К., звароту да асобных важных бакоў сучаснага жыцця садзейнічалі лепшыя фільмы т. зв. «новай хвалі» ў франц. кіно (Ж. Л. Гадар, Ж. Дэмі, А. Кальві, К. Маркер, А. Рэнэ, Ф. Труфо і інш.). У К., як і ў інш. відах мастацтва, сутыкаюцца процілеглыя сілы і тэндэнцыі. Ва ўмовах капіталіст. краін, нягледзячы на разнастайнасць стыляў, плыняў, філасофскіх і эстэт. павіцый дзеячаў кіно, К. залежыць ад бурж. густаў, ад пануючай ідэалогіі. Лепшыя творы К. сацыяліст. краін, фільмы прагрэс. замежных рэжысёраў, маладое К. краін, якія развіваюцца, процістаяць бурж. К.

На Беларусі да Сав. улады кінавытворчасці не было. Існаваў прыватны пракат фільмаў (56 стацыянарных кінаўстановак у 1914). Першыя кіназдымкі на тэрыторыі Беларусі зроблены аператарамі-кінахранікёрамі Петраграда і Масквы. Ў 1922 створана кінаўпраўленне «Кінарэсбел» («Кіно рэспублікі Беларусі»), у 1924 арг-цыя Бел. пралеткіно, якія займаліся пракатам. Каб наладзіць нац. кінавытворчасць, у 1924 арганізавана *Белдзяржкіно*, у 1928 — кінастудыя, «Савецкая Беларусь» (з 1946 *«Беларусьфільм»*). У 1925 зняты кінастужкі пра святкаванне 1 Мая ў Мінску, VII з'езд Саветаў БССР і інш. падзеі грамадскага жыцця; кінанарысы «У здаровым целе — здаровы дух», «Меліярацыя БССР». У 1927—30 створаны шэраг вял. дакумент. фільмаў: «Такая наша Беларусь» (1927), «Калгас» (1928), «Беларуская вёска» (1929), «Гомельшчына», «За калектывізацыю», «Асінбуд» (усе ў 1930). У 1926 выйшаў першы маст. фільм пра партыз. барацьбу бел. народа ў грамадз. вайну «Лясная быль» (рэж. Ю. Тарыч), які ўваходзіць у лік найлепшых твораў бел. К. У 2-й пал. 20 — пач. 30-х г. бел. К. звяртаецца да сучаснай тэматыкі: «У вялікім горадзе» (1928, М. Авербах і М. Данской), «Песня вясны» (1929, У. Гардзін), «Да заўтра» (1929, Тарыч), «Джэнтльмен і певень» (1929, У. Балюзак), «Суд павінен ісці далей», «Жанчына» (1931, 1932,



Кінамастацтва І.

Кадры і фрагменты кадраў з кінафільмаў:
1. «Новыя часы», рэж. Ч. Чаплін. ЗША. 1935.
2. «Прагнасць», рэж. Э. Штрогейм. ЗША. 1924.
3. «Набярэжная туманаў», рэж. М. Карнэ. Францыя. 1938.
4. «Выкрадальнікі веласіпедаў», рэж. В. Дэ Сіка. Італія. 1948.
5. «Попел і дыямент», рэж. А. Вайда, Польшча. 1958.

З савецкіх кінафільмаў:
6. «Браняносец «Пацёмкін», рэж. С. М. Эйзенштэйн. 1925.
7. «Маці», рэж. У. І. Пудоўкін. 1926.









Кінамастацтва II.

Кадры і фрагменты кадраў з савецкіх кінафільмаў:
1. «Пуцёўка ў жыццё», рэж. М. У. Эк. 1931.
2. «Іван Грозны», рэж. С. М. Эйзенштэйн. 1945.
3. «Балада пра салдата», рэж. Р. Н. Чухрай. 1959.
4. «Чапаеў», рэж. браты Васільевы. 1934.
5. «Ленін у Кастрычніку», рэж. М. І. Ром. 1937.
6. «Старшыня», рэж. А. А. Салтыкоў. 1965.
7. «Вайна і мір», рэж. С. Ф. Бандарчук. 1965;
8. «Вялікая сям'я», рэж. І. Я. Хейфіц. 1954.

















Кінамастацтва III.

Кадры і фрагменты кадраў з беларускіх кінафільмаў:
1. «Лясная быль», рэж. Ю. В. Тарыч. 1926.
2. «У агні народжаная», рэж. У. У. Корш-Саблін. 1930.
3. «Двойчы народжаны», рэж. Э. Л. Аршанскі. 1934
4. «Адзінаццатага ліпеня», рэж. Ю. В. Тарыч. 1938.
5. «Канстанцін Заслонаў», рэж. А. М. Файнцымер. 1949.
6. «Хто смяецца апошнім», рэж. У. У. Корш-Саблін. 1954.







1



2



3



4



5

Кінамастацтва IV.

Кадры і фрагменты кадраў з беларускіх кінафільмаў:

1. «Чырвонае лісце», рэж. У. У. Корш-Саблін. 1958.
2. «Гадзіннік спыніўся апоўначы», рэж. М. М. Фігуроўскі. 1958.
3. «Дзяўчынка шукае бацьку», рэж. Л. У. Голуб. 1959.
4. «Горад майстроў», рэж. У. С. Бычкоў. 1965.
5. «Альпійская балада», рэж. Б. М. Сцяпанаў. 1966.
6. «Іван Макаравіч», рэж. І. М. Дабралюбаў. 1968.
7. «Паланез Агінскага», рэж. Л. У. Голуб. 1971.



6



7









Кадры з кінафільмаў. У в е р с е: «Я, Францыск Скарына» (рэж. Б. М. Сцяпанаў, 1970) і «Лёс чалавека» (рэж. С. Ф. Бандарчук, 1959). У н і з е: «Камуніст» (рэж. Ю. Я. Райзман, 1958) і «Рудабельская рэспубліка» (рэж. М. А. Калінін, 1972).

Я. Дзіган), «Вяртанне Нейтана Бекера» (1932, Р. Мільман і Б. Шпіс). Вядучае месца ў 20-я — пач. 30-х г. займалі гісторыка-рэвалюц. фільмы. Пераважалі стужкі пра рэальныя падзеі і герояў мінулага: «Кастусь Каліноўскі» (1928, Гардзін), «Яго яснавяльможнасць» (1928, Р. Рашаль), «Атэль «Савой» (1930, А. Файнцымер), найб. значныя з іх — «Хвоі гамоняць» (1929, Л. Малчанаў), «У агні народжаная» (1930, У. Корш-Саблін). У пач. 30-х г. вял. месца ў кінавытворчасці займалі агітпрапфільмы (у 1931—32 знята 14 поўнаметражных фільмаў). Новы этап развіцця бел. кінематаграфіі пачынае фільм «Першы ўзвод» (1933, Корш-Саблін), адзін з найб. значных твораў бел. даваен. К. Гісторыка-рэвалюц. тэма распрацоўвалася далей у фільмах «Балтыйцы» (1937, Файнцымер), «Адзінаццатага ліпеня» (1938, Тарыч), «Вогненныя гады» (1939, Корш-Саблін). На гістар. матэрыяле створаны фільм «Паручнік Кіжэ» (1934, Файнцымер). Фарміраванне чалавека ва ўмовах сацыялісц. рэчаіснасці, новага светапогляду вызначае пошукі майстроў кіно ў вырашэнні тэм сучаснасці: «Двойчы народжаны» (1934, Э. Аршанскі), «Залатыя агні», «Шукальнікі шчасця» (1935, 1936, Корш-Саблін), «Шлях карабля» (1935, Тарыч) і інш. Экранізуюцца творы л-ры: «Палескія рабінзоны» (1935, І. Бахар і П. Малчанаў), «Салавей» (1937, Аршанскі), «Мядзведзь» і «Чалавек у футарале» (1938, 1939, І. Анепскі). Працуюць рэжысёры Аршанскі, Корш-Саблін, Тарыч, Файнцымер, сцэнарысты Б. Брадзянскі, А. Вольны, Р. Кобец, аператары С. Іваноў, Б. Рабаў, Д. Шлюглейт. У бел. К. працаваў кампазітар І. Дунаеўскі. У Айч. вайну бел. кінадакументалісты здымалі хроніку на фронце і ў партыз. атрадах. Створаны маст. фільм «Беларускія навелы» (1942, Корш-Саблін і Тарыч), фільм-канцэрт «Жыві, родная Беларусь!» і дакументальны «Вызваленне Савецкай Беларусі» (1944, Корш-Саблін і М. Садковіч). У пасляваен. час дасягненні ў бел. К. звязаны з паказам Вял. Айч. вайны. Лепшыя бел. фільмы спалучаюць сац. і псіхал. глыбіню, дакладную распрацоўку характараў з праўдзівым адлюстраваннем гераічнай барацьбы сав. народа. Найб. значныя творы бел. К. пра Айч. вайну: «Канстанцін Заслонаў» (1949, Корш-Саблін і Файнцымер), «Гадзіннік спыніўся апоўначы» (1958, М. Фігуроўскі), «Праз могілкі» і «Я родам з дзяцінства» (1965, 1967, В. Тураў), «Альпійская балада» (1966, Б. Сцяпанаў). К. папулярызуе дасягненні т-ра — экранізацыі спектакляў з удзелам вядучых артыстаў т-ра імя Я. Купалы: «Паўлінка» (1952, А. Зархі), «Пяюць жаваранкі» (1953, Корш-Саблін і К. Саннікаў), «Хто смяецца апошнім» (1954, Корш-Саблін). З сярэдзіны 50-х г. большая ўвага аддаецца сучаснай праблематыцы: «Нашы суседзі» (1957, С. Сплашноў), «Шчасце трэба берагчы» (1958, І. Шульман), «Напярэдзе — круты паварот» (1960, Р. Віктараў), «Апошні хлеб» (1963, Сцяпанаў). Шмат зрабілі бел. кінематаграфісты для развіцця сав. К. для дзяцей — «Дзеці партызана» (1954, Л. Голуб і Фігуроўскі), «Міколка-паравоз», «Дзяўчынка шукае бацьку», «Паланез Агінскага» (1957, 1959, 1971, усіх рэж. Голуб), «Горад майстроў» (1965, У. Бычкоў), «Іван Макаравіч» (1968, І. Дабралюбаў). Ствараюцца гісторыка-рэвалюц. і гістар. творы, найб. значныя — «Чырвонае лісце», «Першыя выпрабаванні», «Крушэнне імперыі» (1958, 1960—61, 1971, Корш-Саблін), «Масква — Генуя» (1964, А. Спешнеў з удзелам Корш-Сабліна і П. Арманда), «Я, Францыск Скарына» (1970, Сцяпанаў), «Рудабельская рэспубліка» (1972, М. Калінін). Працуюць майстры старэйшага пакалення — рэжысёры Голуб, Корш-Саблін,

Сплашноў, Шульман, аператары У. Акуліч, А. Булінскі і інш. У пач. 60-х г. у бел. К. прыходзяць маладыя рэжысёры Бычкоў, Віктараў, Сцяпанаў, Тураў, аператары А. Забалоцкі, Ю. Марухін і інш. Фільмы 60-х г. вызначаюцца пошукам новых маст. вырашэнняў, раскрыццём псіхалогіі характараў герояў, імкненнем глыбока адлюстраваць Айч. вайну. Працуюць кінадакументалісты П. Аліфярэнка, М. Бераў, І. Вейняровіч, М. Гарбуноў, В. Дашук, Ю. Лысятаў, І. Пікман, Р. Масальскі, У. Стральцоў, М. Хубаў, У. Цяслюк, П. Шамшур, В. Шаталаў. Вядомасць атрымалі фільмы: «Праўда пра сектантаў-пяцідзесятнікаў» (1958), «Цытадэль славы» (1960), «Дарога без прывалу» (1965), «Арліная крыніца» (1966), «Генерал Пушча» (1967), «Штрыхі да партрэта» (1968), «У агні жыцця», «Боль мой — Хатынь» (1969). Іл. гл. таксама на ўкл. Спіс фільмаў гл. пры артыкулах *«Беларусьфільм»* і *Мінская студыя навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў.*

Літ.: Самое важное из всех искусств. Ленин о кино, М., 1963; Очерки истории советского кино, т. 1—3, М., 1956—61; Пудовкин В. Избр. ст., М., 1955; Эйзенштейн С. Избр. произв., т. 1—6, М., 1964—71; История советского кино, в 4 томах, т. 1, М., 1969; Комаров С. История зарубежного кино, т. 1, М., 1965; Колодяжная В. и Трутко И. История зарубежного кино, т. 2, М., 1970; История белорусского кино, ч. 1—2, Мн., 1969—70; Садуль Ж. Всеобщая история кино, т. 1—3, 6, пер. с франц., М., 1958—63; Теплиц Е. История киноискусства, пер. с польск., М., 1968.

Л. Я. Сарпінская. Масква; *А. В. Красінскі* (бел. кінамастацтва). Мінск.

КІНАПАНАРА́МА, гл. *Панарамнае кіно.*

КІНАПЕРАСО́ЎКА, партатыўная кінааапаратура для дэманстравання кінафільмаў.

У камплект К. ўваходзяць: *кінапраекцыйны апарат*, пераважна для 16-*мм* плёнкі, *кінаэкран*, узмацняльнае прыстасаванне, гучнагаварыцелі, аўтатрансфарматар, перасоўная электрастанцыя (для мясцін, дзе няма электрасеткі). К. шырока карыстаюцца ў сельскай мясцовасці. Гл. таксама *Кінафікацыя.*

Літ.: Красовский Э. Э. Пособие киномеханику, 3 изд., Мн., 1968.

КІНАПЛЁНКА, святлоадчувальны слой на гнуткай празрыстай перфарыраванай аснове для кіназдымкі, гуказапісу і друку чорна-белых і каляровых кінафільмаў.

Асн. віды К.: негатыўная (для здымкі); пазітыўная (для друку фільмакопій); дубль-негатыўная і дубль-пазітыўная (для атрымання прамежкавых пазітываў і негатываў, з якіх друкуецца вял. колькасць фільмакопій); гукатэхнічная (для аптычнага гуказапісу); зваротная (здымка кінафільмаў з пазітыўнай вынвай, што атрымліваецца ў працэсе спец. апрацоўкі К.). К. бываюць чорна-белыя і каляровыя (маскіраваныя і немаскіраваныя). Спец. віды К. (напр., матрычная, бланкфільм) ужываюцца пры друку каляровых фільмаў спосабам гідратыпіі, для камбінаванай здымкі і інш. К. выпускаюцца шырынёй 70 *мм* (для шырокафарматных фільмаў), 35 *мм* (для звычайных і шырокаэкранных), 16 *мм* (для тэлевізійных і аматарскіх) і 8 *мм* (для аматарскіх).

КІНАПРАЕКЦЫЙНЫ АПАРА́Т (кінапраектар), апарат для ўзнаўлення на экране ў павялічаным памеры серыі кадраў кінавыяў.

У залежнасці ад фармату фільмаў К. а. падзяляюцца на 70-*мм* (шырокафарматныя), 35-*мм* (звычайныя і шырокаэкранныя), 16 і 8-*мм* (вузкаплёначныя). Стэрэаскапічныя, панарамныя, кругарамныя і інш. віды фільмаў дэманструюцца К. а. спецыяльнай канструкцыі. Паводле прызначэння адрозніваюць: стацыянарныя, імі абсталёўваюцца апаратныя кінатэатраў, клубаў і г. д.; перасоўныя; школьныя і аматарскія. Усе прафесійныя К. а.— гукавыя; школьныя і аматарскія могуць быць нямыя і агучаныя (з дапамогай спец. прыстасавання да магнітафона). Крыніца святла ў стацыянарных — ксенонавая лямпа з дугавым разрадам і эл. дуга, якія сілкуюцца пастаянным токам, у астатніх — праекцыйныя лямпы напальвання. У БССР К. а. выраблялюцца на Мінскім з-дзе імя Вавілава. Экспартуюцца ў многія краіны свету.

Універсальны кінапраектар КП-15.



Літ.: Кулагин С. В. Киносъемочная и кинопроекционная аппаратура, М., 1967.

КІНАСТУДЫЯ (ад *кіна...*+італьян. studio вывучэнне), прадпрыемства, на якім ствараюцца кінафільмы. Бываюць К. мастацкіх, дакументальна-хранікальных, навукова-папулярных, навучальных, мультыплікацыйных фільмаў; аб'яднаныя К. выпускаюць фільмы розных жанраў.

Сучасная К.— прадпрыемства з закончаным цыклам работ, што забяспечвае ўвесь працэс стварэння фільмаў ад кінасцэнарыя да вырабу фільмакопій. Пры К. працуюць мастацкія саветы. К. мае аддзелы: сцэнарны, акцёрскі, падрыхтоўкі здымкі; тэхнічны і майстэрні: дэкаратыўна-тэхн. абсталявання, здымачнай тэхнікі, камбінаванай здымкі, апрацоўкі кінаплёнак, кінамантажу, гукатэхнічны і інш. Асн. вытворчыя памяшканні К. мастацкіх фільмаў — кіназдымачныя павільёны, абсталяваныя спец. сталямі для мантажу асвятляльнай апаратуры. К. мультыплікацыйных рысаваных і аб'ёмных фільмаў абсталяваны адна- і шматпланавымі мультстанкамі, спецыялізаванымі кіназдымачнымі апаратамі і інш. У БССР працуе адна з буйнейшых К. краіны *«Беларусьфільм»*. *Б. А. Папоў.* Мінск.

КІНАТЭА́ТР, будынак ці памяшканне, абсталяванае для паказу кінафільмаў.

Большасць сучасных К. разлічана на паказ звычайных і шырокаэкранных фільмаў; універсальныя К.— звычайных, шырокаэкранных і шырокафарматных фільмаў з стэрэафанічным гукаўзнаўленнем. Для дэманстрацыі спец. відаў фільмаў існуюць К.: стэрэаскапічныя, панарамныя, кругарамныя, дзённага кіно і інш. Сярэдняя ўмяшчальнасць глядзельных залаў 200—1000 месцаў. Вялікія К. маюць 2—3 і больш глядзельных залаў, дзе дэманструюцца адначасова розныя фільмы. У СССР прыняты пасеансавы паказ, што забяспечвае цэльнае ўспрыманне кінафільма гледачамі. У некат. краінах бесперапынны паказ фільмаў — гледачы ўваходзяць у залу і выходзяць у любы час. Гл. таксама *Кінафікацыя.*

Глядзельная зала кінатэатра «Партызан» у Мінску.



КІНАФЕСТЫВА́ЛІ ПРЫБАЛТЫЙСКІХ РЭСПУБЛІК, БЕЛАРУСКАЙ І МАЛДА́ЎСКАЙ ССР, агляд твораў кінамастацтва Латвіі, Літвы, Эстоніі, Беларусі і Малдавіі. Наладжваюцца ў адной са сталіц гэтых рэспублік. З 1959 да 1965 праводзіліся кінафестывалі Прыбалтыйскіх рэспублік і Беларускай ССР.

Беларускія мастацкія і дакументальныя фільмы, адзначаныя ўзнагародамі на кінафестывалях (у дужках гарады кінафестывалю і прозвішчы ўзнагароджаных стваральнікаў фільмаў).

1960 (Рыга). «Дзяўчынка шукае бацьку» (рэж. Л. Голуб, сцэнарысты К. Губарэвіч і Я. Рыс, гукааператар М. Ведзянееў, кампазітары Ю. Бяльзацкі і У. Алоўнікаў); «Праўда пра сектантаў-пяцідзесятнікаў», дыплом 2-й ступені. 1964 (Мінск). «Трэцяя ракета» (сцэнарыст В. Быкаў, аператары А. Кірылаў і М. Хубаў). 1965 (Талін). «Праз моладзь» (рэж. В. Тураў, мастакі У. Дзямянцьеў і Я. Ігнацьеў), дыплом 2-й ступені; «Лісты да жывых (арт. С. Макарава); «Есць такая зямля», дыплом 1-й ступені; «Працаўнікі лесу» і кінасюіс «Савецкая Беларусь», дыпломы 2-й ступені. 1966 (Вільнюс). «Альпійская балада» (арт. Л. Румянцава, аператар А. Забалоцкі); «Горад майстроў» (рэж. У. Бычкоў, мастак А. Бойм); «Мелодыя вясны» (апер. В. Шаталаў). 1967 (Кішынёў). «Я родам з дзяцінства» (рэж. В. Тураў, арт. Н. Ургант); «Шчырая размова», спец. дыплом журы. 1968 (Рыга). «Анюціна дарога» (рэж. Л. Голуб); «Тысяча вокнаў» (рэж. А. Спешнеў); «Генерал Пушча», ганаровы дыплом журы М. Быкаву і М. Сухавай (пасмяротна), І. Вейняровічу, А. Рэйзман, С. Школьнікаву, У. Цеслюку за здымкі ў Вял. Айч. вайну, якія сталі асновай для стварэння фільма; «Пакараны смерцю ў 1941» (сцэнарыст В. Марозаў, рэж. В. Чацверыкоў); «Першыя ноты» (рэж.-аператар Шаталаў). 1969 (Мінск). «Іван Макаравіч», спец. прыз і дыплом 1-й ступені; «Штрыхі да партрэта», прэмія і дыплом; «Паляванне са старым сабакам» (аператар А. Сіманаў); кінаальманах «Нас вадзіла маладосць», дыплом.

В. Ф. Нячай. Мінск.

КІНАФЕСТЫВА́ЛЬ, агляд твораў кінамастацтва з мэтаю абмяняцца вопытам і выявіць дасягненні за пэўны перыяд. Лепшым фільмам і іх стваральнікам (рэжысёрам, аператарам, сцэнарыстам, кампазітарам, мастакам) на К. прысуджаюцца прэміі, прызы, дыпломы. Традыц. форма аглядаў — Міжнар. К. (Мкф). Буйныя Мкф адбываюцца ў Венецыі (Італія, з 1932), Маскве (СССР, у 1935 і з 1959), Кане (Францыя, з 1946), Карлавых Варах (Чэхаславакія, з 1950), Зах. Берліне (з 1951). У краінах з развітай кінематаграфіяй наладжваюцца К. айчынных фільмаў; у СССР — К. кінамастацтва саюзных нац. рэспублік, у т. л. *Кінафестывалі Прыбалтыйскіх рэспублік, Беларускай і Малдаўскай ССР.* З 1958 у розных гарадах краіны праводзіцца Усесаюзны К. (Укф).

Беларускія мастацкія фільмы, адзначаныя ўзнагародамі на Мкф. «Дзяўчынка шукае бацьку» (арт. А. Камянкова — прэмія 2-га Мкф у Мар-дэль-Плаце, 1960; валатая пласціна і дыплом 2-га Мкф у Вічэнцы, 1965), «Пушчык едзе ў Прагу» (прэмія ЦК Чэхаславацкага Саюза моладзі 1-га Мкф для дзяцей і юнацтва ў Готвальдаве, 1965), «Альпійская балада» (прэмія Мкф у Дэлі, 1968), «Іван Макаравіч» (1-я прэмія і прыз «Сярэбраная Мінерва» 22-га Мкф дзіцячых фільмаў у Венецыі, 1970).

Беларускія мастацкія фільмы, адзначаныя ўзнагародамі на Укф. «Дзяўчынка шукае бацьку» (1-я прэмія, мастаку Ю. Вулычаву 2-я прэмія Укф у Мінску, 1960), «Масква — Генуя» (2-я прэмія Укф у Ленінградзе, 1964), «Я, Францыск Скарына» (дыплом Укф у Мінску, 1969), «Іван Макаравіч» (дыплом Укф у Мінску, 1969).

Беларускія дакументальныя фільмы, адзначаныя ўзнагародамі на Укф. «Урок даўжынёю ў год» (прыз Укф у Ленінградзе, 1964), «Генерал Пушча» (дыплом Укф у Ленінградзе, 1968), «Боль мой — Хатынь» (дыплом 1-я прэмія Укф у Мінску, 1969), «Штрыхі да партрэта» (дыплом Укф у Мінску, 1969), кінаасопіс «Піянер Беларусі» за 1969. № 2 (дыплом Укф у Мінску, 1969). *В. Ф. Нячай.* Мінск.

КІНАФІКА́ЦЫЯ, сістэма мерапрыемстваў, якая забяспечвае рэгулярнае дэманстраванне кінафільмаў і развіццё кінасеткі. У БССР К. ажыццяўляюць Гал. ўпраўленне кінафікацыі і кінапракату Дзярж. камітэта Савета Міністраў БССР па кінематаграфіі і яго органы на месцах.

У БССР (на 1.1.1971) 167 гарадскіх кінатэатраў, 6320 кінаўстановак (3126 шырокаэкранных і 15 шырокафарматных), а іх 5779 у вёсках. К. ахоплівае ўсе населеныя пункты, якія маюць больш за 25 двароў. У БССР на 1000 чал. гарадскога нас. 40 глядзельных месцаў, на 10 тыс. сельскага нас.— 11,5 кінаўстановак. Кінасетка абсталёўваецца найноўшымі праекцыйнымі апаратамі, укараняецца сістэма аўтаматызаванага кіравання дэманстрацыяй кіно, пашыраецца К. навуч. працэсу ў школах, сярэдніх спец. навуч. установах, ВНУ.

Літ.: Очерки истории советского кино, т. 1—3, М., 1956—61; История белорусского кино, ч. 1—2, Мн., 1969—70.

В. А. Поляк. Мінск.

КІНАФІЛЬМ (ад *кіна...*+англ. film плёнка), твор *кінамастацтва.* Ствараецца на кінастудыях. К. падзяляюцца на 5 асн. катэгорый: мастацкія (ігравыя), мастацка-мультыплікацыйныя (лялечныя і графічныя), хранікальна-дакументальныя, навукова-папулярныя і навучальна-інструкцыйныя.

К. адрозніваюцца жанрамі, нац. прыналежнасцю, мастацкім кірункам, колерам, фарматам плёнкі (кадраў) (гл. *Каляровае кіно, Панарамнае кіно, Стэрэаскапічнае кіно, Шырокафарматнае кіно, Шырокаэкраннае кіно, Кругарама, Цыркарама*). Развіццё кінатэхнікі дае магчымасць ствараць новыя віды і жанры К., напр., спалучэнне фільма з сінхроннаю ігрою артыстаў, фільмы без экрана (з выкарыстаннем лазераў), *тэлефільмы*, відэамагнітафільмы, запісаныя на магнітную стужку, і інш. Гл. таксама *Кінамастацтва.* *В. Ф. Нячай.* Мінск.

КІНАЧАСО́ПІС, перыядычны кінавыпуск, які змяшчае інфармацыю пра розныя грамадска-палітычныя падзеі. Складаецца з асобных эпізодаў-сюжэтаў. У СССР выходзіць больш за 50 К. Найб. папулярныя: «Навіны дня» (з 1925), «Піянерыя» (з 1931), «Навіны сельскай гаспадаркі» (з 1950), «Замежная кінахроніка» (з 1958) і інш. На Беларусі выходзяць К.: «Савецкая Беларусь» (з 1926, рэгулярна з 1931), «Піянер Беларусі» (з 1952), «Спартыўны агляд» і «Мастацтва Беларусі» (з 1961). У пач. 30-х г. выходзіў К. «Чэкіст» («На варце»). Гл. таксама *Дакументальнае кіно.*

КІНАЭКРА́Н (ад *кіна...*+франц. écran шырма), прыстасаванне, на паверхню якога праектуецца кінафільм.

Падзяляюцца на святлоадбівальныя і святлопрапускальныя; у залежнасці ад характару святлоразмеркавання — на дыфузныя (каэфіцыент яркасці мала залежыць ад кірунку праектавання) і К. накіраванага дзеяння. Найб. распаўсюджаны святлоадбівальныя дыфузныя К., якія забяспечваюць раўнамерную яркасць вынвы. Для паказу звычайных кінафільмаў выкарыстоўваюцца плос-

кіл К., ў *кінаперасоўках* — партатыўныя, якія згортваюцца ў трубку; для шырокаэкранных — угнутыя (крывалінейныя); для шырокафарматных — таксама ўгнутыя, аднак з большай крывізной. На шырокафарматных К. могуць дэманстравацца звычайныя і шырокаэкранныя фільмы. У *панарамным кіно* ўжываецца вял. цыліндрычны экран з вуглом агляду да 150—170° (па гарызанталі). У *цыркараме* К. акружае глядзельную залу (поле зроку 360°). У *кругараме* экран таксама акружае гледача з усіх бакоў. Асн. матэрыял для вял. К.— спец. рулонны полівініл-хларыдны пластыкат, які злучаецца высокачастотнай электразваркай у экраннае палотнішча.

КІНГ (King) Марцін Лютэр (15.1.1929, г. Атланта — 4.4.1968), негрыцянскі грамадскі дзеяч ЗША, адзін з кіраўнікоў барацьбы за грамадзянскія правы неграў. Д-р філасофіі (1965). З сям'і пастара. Вучыўся ў Гарвардскім і Бостанскім ун-тах. У 1947 пасвечаны ў сан свяшчэнніка. У 1957 узначаліў негрыцянскую арг-цыю «Канферэнцыя хрысціянскага кіраўніцтва на Поўдні», кіраваў усімі больш значнымі выступленнямі неграў за свае правы. Прыхільнік ненасільных дзеянняў. За прагрэс. дзейнасць няраз арыштоўваўся. Аўтар кніг «Крок да свабоды» (1958), «Сіла любові» (1963), «Чаму мы не можам чакаць» (1964). Выступаў супраць агрэс. палітыкі амер. ўрада ў В'етнаме. У крас. 1968 рыхтаваў паход амер. беднаты ў Вашынгтон. Забіты расістамі ў Мемфісе (штат Тэнесі). Нобелеўская прэмія міру за 1964.

Тв.: Рус. пер.— Есть у меня мечта..., М., 1970.
Літ.: Кондрашов С. Н. Жизнь и смерть Мартина Лютера Кинга, М., 1970; Герасимов Г., Кузнецов Г. и Морев В. Набат в ночи, М., 1968.

КІНГІСЕП Віктар Эдуардавіч [12(24).3.1888, в-аў Сарэма — 4.5.1922], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў кампартыі Эстоніі, удзельнік барацьбы за ўладу Саветаў у Прыбалтыцы. З рабочых. Чл. КПСС з 1906. Рэвалюц. дзейнасць пачаў у 1905 у Пецярбурзе, Таліне. Пасля Лют. рэв. 1917 у Эстоніі ўзначаліў бальшавіцкую арг-цыю. З 22.10(4.11).1917 кіраваў дзейнасцю ВРК пры Выканкоме Саветаў Эстляндскага краю, арганізатар Чырв. гвардыі; з 26.10(8.11).1917 чл. выканкома Савета рабочых і вайсковых дэпутатаў Эстоніі. З лютага 1918 у Маскве ў Вярх. судзе і органах ВЧК. У 1918 выбраны чл. ВЦВК. У 1918—22 кіраўнік кампартыі Эстоніі. Расстраляны паводле прыгавору ваен.-палявога суда бурж. Эстоніі. Яго імем названы гарады ў Эстоніі і ў Ленінградскай вобл.

КІНГСТАН (Kingston), сталіца Ямайкі, на ПдУ аднайменнага в-ва. Засн. ў 1693. Вузел чыг. і шашэйных дарог. Аэрапорт. Порт (вываз цукру, рому, баксітаў, кавы, бавоўны). 494 тыс. ж. (з прыгарадамі, 1969). Філіялы вял. банкаў Вялікабрытаніі, ЗША, Канады, прадстаўніцтвы замежных манаполій. Прадпрыемствы па вытворчасці харч. тавараў, рому, цыгар і цыгарэт, касметычных і швейных вырабаў, абутку, мэблі, запалак; у прыгарадзе цэментны з-д. Універсітэцкі коледж, ін-т Ямайкі.

КІНЕМАТАГРАФІЧНАЯ АДУКАЦЫЯ, падрыхтоўка ў спец. навуч. установах спецыялістаў для кінематаграфіі і тэлебачання. Існуе 2 віды К. а.: творчая і тэхнічная.

Творчых работнікаў кінематаграфіі рыхтуе Усесаюзны ін-т кінематаграфіі. Засн. ў Маскве ў 1919 як дзярж. кінашкола (першая ў свеце). У 1930 рэарганізавана ў ін-т кінематаграфіі, а 1938 Усесаюзны ін-т кінематаграфіі. Спецыяльнасці (1971): акцёр драм. тэатра і кіно, кінарэжысура, кінааператарства, кінанавука, літ. работа (сцэнарыст), эканоміка кінематаграфіі, жывапіс, графіка. Пры ін-це ў 1934—38 існавала кінаакадэмія. Тэхнічную К. а. дае Ленінградскі ін-т кінаінжынераў. Засн. ў 1930 у Ленінградзе на базе фотатэхн. тэхнікума. Спецыяльнасці (1971): гукатэхніка, кінааапаратура, хім. тэхналогія кінафотаматэрыялаў. К. а. таксама даюць Азербайджанскі ін-т мастацтваў імя Аліева, Беларускі тэатр.-маст. ін-т, Дзярж. ін-т тэатр. мастацтва імя Луначарскага ў Маскве, Кіеўскі ін-т тэатр. мастацтва імя Карпенкі-Карага, Ленінградскі ін-т тэатра, музыкі і кінематаграфіі, Ташкенцкі тэатр.-маст. ін-т імя Астроўскага, Тбіліскі тэатр. ін-т імя Руставелі; у Маскве — Тэатр. вуч. імя Шчэпкіна, Тэатр. вуч. імя Шчукіна, Школа-студыя імя Неміровіча-Данчанкі; некаторыя *мастацкія акадэміі і інстытуты*. Тэхнікаў па кінаабсталяванні і эксплуатацыі кінаўстановак рыхтуюць кінатэхнікумы ў Растове-на-Доне, Ленінградзе, Алма-Аце, Львове, Варонежы, Загорску і інш.

КІНЕМАТАГРАФІЯ, к і н о (ад. грэч. kinēma рух+...*графія*), галіна культуры і народнай гаспадаркі па вытворчасці кінафільмаў і паказе іх гледачу. Кіно з'яўляецца найб. масавым відам мастацтва, важным сродкам паліт. і навук. прапаганды. Творчыя магчымасці К. вызначаюцца яе тэхн. узроўнем, росквіт *кінамастацтва* ў сваю чаргу выклікае ўдасканаленне кінатэхнікі. Гл. *Кінематограф*.

КІНЕМАТОГРАФ, у агульным сэнсе — комплекс апаратаў, прыстасаванняў і метадаў, якія забяспечваюць здымку і дэманстраванне *кінафільмаў*; тэрмін таксама ўжываецца для абазначэння відовішчнага мастацтва, якое ўзнікла на аснове тэхнікі кіно (гл. *Кінамастацтва*). Апараты, у якіх спалучаліся асн. элементы К., вынайшлі ў розных краінах у канцы 19 ст.: браты Л. і А. Люм'ер (1895, Францыя); М. Складаноўскі (1895, Германія); А. Самарскі (1896, Расія) і інш. Спачатку дэманстраваліся нямыя фільмы з муз. акампанементам. У 1927 на аснове нямога К. ўзнікла гукавое кіно — здымка і дэманстраванне фільмаў, у якіх на кінаплёнцы сумяшчаюцца выява і фанаграма з гуказапісам дыялогаў, музыкі і шумаў (гл. *Кіназдымка*). У сярэдзіне 20 ст. пачало развівацца каляровае, панарамнае, стэрэаскапічнае, шырокафарматнае, шырокаэкраннае кіно, кругарама, цыркарама (гл. адпаведныя арт.). Кіно стала важнай галіной культуры і нар. гаспадаркі (гл. *Кінафікацыя*).

КІНЕМАТЫКА, раздзел *механікі*, у якім вывучаюцца геаметрычныя ўласцівасці руху цэлаў без уліку іх масы і сіл, што на іх дзейнічаюць. Звычайна падзяляецца на К. матэрыяльнага пункта і К. цвёрдага цела. Асн. задачы К.— знаходжанне траекторый, скорасцей, паскарэнняў пунктаў і цэлаў.

Становішча пункта (ці цела) адносна пэўнай сістэмы адліку вызначаецца ўраўненнямі, якія выражаюць залежнасць каардынатаў q_i ад часу t $[q_i=q_i(t)]$ і наз. законамі руху. Звычайна яны задаюцца ў каардынатнай $[x=x(t),\ y=y(t),\ z=z(t)]$ або вектарнай $[\vec{r}=\vec{r}(t)]$ формах, дзе x, y, z — каардынаты пункта, $\vec{r}$ — яго радыус-вектар. Функцыі, якія вызначаюць законы руху, адназначныя (аб'ект не можа займаць розныя становішчы ў адзін і той жа момант часу) і двойчы дыферэнцыяваль-

ныя (паколькі ў кожны момант існуюць скорасці $v_i=dq_i/dt$ і паскарэнні $w_i=d^2q_i/dt^2$). Колькасць ураўн. роўна колькасці *ступеняў свабоды* аб'екта. У агульным выпадку рух матэрыяльнага пункта апісваецца 3 ураўненнямі, а рух цвёрдага цела — 6. Велічыні і залежнасці, якія вызначаюцца ў К., выкарыстоўваюцца пры разліках перадачы рухаў у *кінематычны механізмах* і пры рашэнні задач *дынамікі*.

Літ.: Ландау Л. Д. и Лифшиц Е. М. Механика. Электродинамика, М., 1969 (Краткий курс теоретической физики, кн. 1). *А. І. Болсун.* Мінск.

КІНЕМАТЫКА МЕХАНІЗМАЎ, раздзел тэорыі механізмаў і машын, у якім вывучаецца рух звенняў механізма з геаметрычнага пункту погляду, без уліку сіл, якія выклікаюць гэты рух.

Адрозніваюць кінематычны аналіз і сінтэз механізмаў. Асн. задачы аналізу: вызначэнне становішчаў звенняў механізма і траекторый руху іх асобных кропак; вызначэнне лінейных скорасцей і паскарэнняў гэтых кропак; вызначэнне вуглавых скорасцей і паскарэнняў самих звенняў. Рашэнне задач аналізу робіцца аналітычна (з дапамогаю сістэм ураўненняў) або графічна (метадамі кінематычных дыяграм, планаў скорасцей і паскарэнняў). Метад кінематычных дыяграм дае магчымасць вызначаць толькі велічыні скорасцей і паскарэнняў кропак звенняў механізма; метадам планаў скорасцей і паскарэнняў вызначаюць велічыню і кірунак скорасцей і паскарэнняў любых кропак звенняў механізма ў любым яго становішчы. Задача кінематычнага сінтэзу — вызначыць структуру механізма і памеры яго звенняў, якія забяспечвалі б наперад зададзены рух вядзёнага звяна пры зададзеных памерах і руху вядучых звенняў.

Літ.: Гл. пры арт. *Механізмаў і машын тэорыя*.
Б. С. Мельнікаў. Мінск.

КІНЕСКОП (ад грэч. kinéō рухаю+skopeō гляджу), *прыёмная тэлевізійная трубка*, якая выкарыстоўваецца ў тэлевізійных прыёмніках для ператварэння электрычных сігналаў у адлюстраванне.

КІНЕТАСТАТЫКА МЕХАНІЗМАЎ (грэч. kinētós рухомы+*статыка*), раздзел тэорыі механізмаў і машын, у якім вывучаюцца спосабы рашэння задач дынамікі механізмаў з дапамогаю аналітычных і графічных метадаў статыкі.

Метады К. м. заснаваны на ўлуленні, што асобныя звенні механізма і механізм у цэлым будуць знаходзіцца ў раўнавазе, калі да ўсіх вонкавых сіл, якія дзейнічаюць на звенні механізма, далучыць сілы інерцыі, у адпаведнасці з прынцыпам Д'Аламбера (гл. *Варыяцыйныя прынцыпы механікі*). Каб знайсці рэакцыі, якія дзейнічаюць на звенні, у такім выпадку можна карыстацца метадамі статыкі.

Літ.: Гл. пры арт. *Дынаміка механізмаў* і *машын*.

КІНЕТЫКА ФІЗІЧНАЯ, раздзел тэарэтычнай фізікі, у якім вывучаюцца мікраскапічныя працэсы, што ўзнікаюць у фіз. сістэмах пры іх адхіленні ад стану тэрмадынамічнай раўнавагі.

Падзяляецца на фенаменалагічную К. ф., якая разглядае законы змены мікраскапічных параметраў (напр., т-ры, канцэнтрацыі часцінак) нераўнаважных сістэм пры дыфузіі, цеплаправоднасці, унутраным трэнні і інш., і статыстычную К. ф., задача якой — вызначэнне кінетычных каэфіцыентаў (напр., каэф. вязкасці, дыфузіі, цеплаправоднасці). Ураўненні фенаменалаг. К. ф. выводзяцца з меркавання, што адхіленні ад раўнавагі (якія звычайна малыя) характарызуюцца градыентамі т-ры і хім. патэнцыялу. Пры палучэнні градыентаў нелінейных велічынь, напр. т-ры і канцэнтрацыі, у сістэме апрача прамых працэсаў пераносу (цеплаправоднасці, дыфузіі) узнікаюць яшчэ т. зв. перакрыжаваныя працэсы (напр., тэрмадыфузія, дыфузійная цеплаправоднасць). Паслядоўны вывад ураўн. фенаменалаг. К. ф. і вызначэнне кінематычных каэф. магчыма толькі з дапамогаю кінетычнага ўраўнення, якое апісвае змену нераўнаважнай функцыі размеркавання сістэмы.

Літ.: Гуревич Л. Э. Основы физической кинетики, Л.— М., 1940; Гуров К. П. Основания кинетической теории, М., 1966.
Г. С. Раманаў. Мінск.

КІНЕТЫКА ХІМІЧНАЯ, раздзел фіз. хіміі, які вывучае скорасці хім. рэакцый.

Рэакцыі могуць адбывацца гамагенна — у аб'ёме адной фазы, напр. у газе ці растворы, і гетэрагенна — на мяжы падзелу дзвюх фаз: газ — вадкасць, вадкасць — вадкасць і інш. Скорасцю рэакцыі наз. колькасць малекул дадзенага тыпу, што рэагуюць, за адзінку часу і ў адзінцы аб'ёму фазы (калі рэакцыя гамагенная) ці на адзінку паверхні падзелу (калі рэакцыя гетэрагенная). Скорасць рэакцыі залежыць ад прыроды рэчываў, што рэагуюць, ад канцэнтрацыі, т-ры, каталізатараў, інтэнсіўнасці святла і інш. Асаблівая роля ў кінетыцы рэакцый адводзіцца *каталізу*. Раскрыццё механізму рэакцыі памагае свядома кіраваць ёю. Вял. значэнне ў навуцы і тэхніцы маюць *ланцуговыя хімічныя рэакцыі*.

Літ.: Кондратьев В. Н. Кинетика химических газовых реакций, М., 1958; Панченков Г. М. и Лебедев В. П. Химическая кинетика и катализ, М., 1961.

КІНЕТЫЧНАЯ ТЭОРЫЯ ГАЗАЎ, раздзел тэарэтычнай фізікі, у якім разглядаюцца нераўнаважныя ўласцівасці газаў, выходзячы з улуленняў пра іх малекулярную будову і законы ўзаемадзеяння паміж часцінкамі.

К. т. г. вывучае дастаткова разрэджаныя сістэмы, у якіх час сутыкнення паміж часцінкамі значна меншы, чым час свабоднага прабегу часцінак. Уласцівасці такіх сістэм апісваюцца адначасцінкавай функцыяй размеркавання $f(\vec{r}, \vec{v}, t)$, якая з'яўляецца шчыльнасцю імавернасці таго, што часцінка ў момант часу t у пункце $\vec{r}$ мае скорасць $\vec{v}$. Функцыя f для канкрэтнай сістэмы пры зададзеных умовах з'яўляецца рашэннем асн. ўраўнення К. т. г.— кінетычнага ўраўн. Больцмана: $\frac{\partial f}{\partial t}+\vec{v}\frac{\partial f}{\partial \vec{r}}+\frac{\vec{F}}{m}\frac{\partial f}{\partial \vec{v}}=I(f)$, дзе $\vec{F}$ — вонкавая сіла, што дзейнічае на малекулу з масай m, а $I(f)$ — т. зв. сутыкняльны інтэграл, які вызначае змену f з-за сутыкненняў часцінак. У выпадку сумесі газаў ураўн. Больцмана замяняецца сістэмай ураўненняў для асобных кампанент. Пасля таго як дакладнае ці набліжанае значэнне f знойдзена, можна вылічыць сярэдніе велічыні, якія характарызуюць стан газу і працэсы ў ім. Выкарыстанне ўраўн. Больцмана ў К. т. г. дае магчымасць вывучаць звалюцыю нераўнаважных сістэм, унутранае трэнне, дыфузію, цеплаправоднасць, атрыманць ураўн. руху газу ў граніцы суцэльнага асяроддзя — ураўн. гідрадынамікі.

Літ.: Гуров К. П. Основания кинетической теории, М., 1966; Коган М. Н. Динамика разреженного газа, М., 1967.
Г. С. Раманаў. Мінск.

КІНЕТЫЧНАЯ ЭНЕРГІЯ, мера механічнага руху, роўная для матэрыяльнага пункта палове здабытку масы пункта на квадрат яго скорасці: $T=\frac{1}{2}mv^2$.

Гэтая формула — граніцны выпадак (v многа менш за c) выразу для T у *адноснасці тэорыі* $T=mc^2\left[\left(1-v^2/c^2\right)^{-1/2}-1\right]$, дзе c — скорасць святла. К. э. сістэмы матэрыяльных пунктаў роўная суме К. э. усіх пунктаў, якія ўтвараюць сістэму. Для цвёрдых цэлаў, якія верцяцца, $T=\frac{1}{2}I\omega^2$, дзе I — момант інерцыі цела, ω — частата вярчэння. Гл. таксама *Энергія*.

КІНЗІКЕЕЎ Ахцям Рахматулавіч (н. 1.1.1922, с. Буздзяк Буздзякскага р-на Башк. АССР), савецкі геолаг. Д-р геолага-мінералаг. н. (1967), праф. (1969). Чл. КПСС з 1944. Да

1969 працаваў у н.-д. арг-цыях Башк. АССР, Тат. АССР і ВНУ гэтых рэспублік, з 1969 заг. кафедры агульнай геалогіі Гомельскага ун-та. Галоўны кірунак навуковай дзейнасці — нафтавая геалогія. Узнагароджаны 2 ордэнамі, медалямі.

Тв.: О методике расчленения и корреляции нефтеносных отложений девона Башкирии, «Геология нефти и газа», 1960, № 7; Опыт фотографирования стенок скважины в карбонатных породах, там жа, 1964, № 7.

КІНО, пашыраная скарочаная назва *кінамастацтва, кінематаграфіі, кінатэатра.*

КІНТАЛЬСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ (2-я Цымервальдская), міжнар. сацыяліст. канферэнцыя. Адбылася 11—17(24—30).4.1916 у швейц. в. Кінталь непадалёку ад Берна. На К. к. былі прадстаўнікі Расіі [ад бальшавікоў (У. І. Ленін, І. Ф. Арманд, Р. Я. Зіноўеў), меншавікоў і эсэраў], Германіі, Францыі, Італіі, Польшчы, Швейцарыі, Аўстрыі, Партугаліі, Сербіі, Нарвегіі. З 43 удзельнікаў К. к. 12 належала да *Цымервальдскай левай*. Аднак на ёй паслядоўную палітыку пралетарскага інтэрнацыяналізму праводзілі толькі бальшавікі на чале з Леніным.

Парадак дня: 1) барацьба за заканчэнне вайны; 2) стаўленне пралетарыяту да пытанняў міру; 3) агітацыя і прапаганда — а) парламенцкая дзейнасць, б) масавая барацьба; 4) скліканне Міжнар. сацыяліст. бюро (МСБ). Рашэнні К. к., у прыватнасці прыняты ёю маніфест супраць вайны, былі больш левыя, чым пастановы 1-й Цымервальдскай канферэнцыі (гл. *Цымервальдская канферэнцыя 1915*). Гэта сведчыла пра ўзмацненне ролі Цымервальдскай левай і рост рэвалюцыянізавання мас. Аднак і гэтыя рашэнні мелі адбітак цэнтралісцкіх поглядаў. Цэнтрысцкая большасць не прыняла асн. лозунгаў бальшавікоў па пытаннях вайны і міру, не падтрымала ленінскага патрабавання аб разрыве з сацыял-шавіністамі і стварэнні 3-га Інтэрнацыянала. Тым не менш К. к. садзейнічала пашырэнню ўплыву бальшавікоў на міжнар. рабочы рух, вылучэнню інтэрнацыяналісцкіх элементаў, якія потым сталі ядром *Камуністычнага Інтэрнацыянала.*

Літ.: Ленін У. І. Праект пастановы аб скліканні другой сацыялістычнай канферэнцыі.— Да канферэнцыі 24 красавіка 1916 г.— Аб «праграме міру».— Прапанова Цэнтральнага Камітэта РСДРП 2-й сацыялістычнай канферэнцыі, Тв., т. 22 (Полн. собр. соч., т. 27); Циммервальдская и Кинтальская конференции. Официальные документы, Л.— М., 1924. *Г. А. Чарнушчанка.* Мінск.

КІНШАСА (да 1966 Леапальдвіль), сталіца *Рэспублікі Заір*. Размешчана на левым беразе р. Конга, за 500 *км* ад яе вусця. Засн. ў 1881. Вузел чыг. і аўтамаб. дарог, аэрапорт (міжнар.), порт. 1,5 млн. ж. (1970). У К. найб. банкі і страхавыя т-вы Заіра. Маслабойныя, мукамольныя і піваварныя з-ды; вытворчасць гліцэрыны, лакаў, фарбаў; метала- і дрэваапр. прадпрыемствы; суднабуд. і суднарамонтныя верфі, чыг. майстэрні. Каталіцкі ун-т (з 1954), музей афр. мастацтва і рамяства, археал. музей, заапарк.

КІОДА ЦУСІН (Аб'яднанае тэлеграфнае агенцтва), японскае інфармацыйнае агенцтва. Засн. ў ліст. 1945 замест прамілітарысцкага тэлегр. агенцтва Домей цусін (існавала з 1936). Знаходзіцца ў Токіо.

К. ц.— акцыянернае аб'яднанне буйных штодзённых газет і яп. радыёвяшчальнай карпарацыі Эн-Эйч-Кей. Мае шырокую карэсп. сетку ў Японіі і за яе межамі, звязана пагадненнямі пра абмен інфармацыяй з многімі нац. і замежнымі тэлегр. агенцтвамі. Забяспечвае штодзённа яп. газеты інфармацыяй аб'ёмам 10—12 газетных палос яп. тэксту, каля 40 фотаздымкаў, замежныя агенцтвы — інфармацыяй да 45 тыс. слоў на англ. мове. Канкурэнт К. ц.— другое па велічыні і значэнні інфарм. агенцтва Японіі Дзідзі цусін (засн. ў 1945).

М. Ф. Дубянецкі. Мінск.

КІПАРЫС (Cupressus), род аднадомных вечназялёных дрэў, радзей кустоў сям. кіпарысавых. Вядома 14 відаў, пашыраных ва ўмерана цёплых зонах Еўропы, Азіі і ў Паўн. Амерыцы. У СССР (Крым, Каўказ, Сярэдняя Азія) культывуюць 11 відаў, з якіх найб. часта — К. вечназялёны (C. sempervirens), асабліва яго пірамідальную форму (як дэкар. дрэва).



Кіпарыс вечназялёны (галінка з шышкамі).

Дрэва даўгавечнае, засухаўстойлівае, выш. 30 *м* і больш. Крона густая, цёмна-зялёная. Лісце лускападобнае, у залозках — эфірны алей. Мужчынскія кветкі ў верхавінкавых суквеццях, жаночыя — у шарападобных шышках. Шышкі дзеравяністыя, выспяваюць на другі год. Насенне плоскатае з крыльцамі. Драўніна араматычная, лёгкая, ідзе на выраб мэблі.

Літ.: Деревья и кустарники СССР, т. 1, М.— Л., 1949.

КІПЕННЕ, пераход вадкасці ў пару, які адбываецца пры вызначанай т-ры не толькі з паверхні, як пры выпарэнні, але і ва ўсім аб'ёме вадкасці. Пры павышэнні вонкавага ціску т-ра К. павышаецца. Пры нармальным атм. ціску (760 *мм рт. сл.* ці 101,325 *кн/м*²) вада кіпіць пры 100 °С, этылавы спірт пры 78,3 °С, жалеза пры 2450 °С.

КІПЛІНГ (Kipling) Джозеф Рэдзьярд (30.12.1865, г. Бамбей — 18.1.1936), англійскі пісьменнік. З сям'і чыноўніка. Аўтар паэт. кніг «Песні казармы» (1892), «Сем мораў» (1896), «Пяць нацый» (1903), раманаў «Святло патухла» (1890), «Кім» (1901), аб. навел «Простыя апавяданні з гор» (1888) і інш. Услаўляў каланізатарскую дзейнасць англ. імперыялістаў, рамантызаваў культ сілы. Вершам К. ўласцівыя блізкасць да англ. фальклору, эмацыянальная мова, дынамічная рытміка. Сюжэтная займальнасць, майстэрства абмалёўкі экзатычных жывёл і раслін абумовілі папулярнасць кніг для дзяцей: «Адважныя мараплаўцы» (1897), «Кніга джунгляў» (1894), «Другая кніга джунгляў» (1895), «Казкі проста так» (1902). Нобелеўская прэмія 1907.

Тв.: Бел. пер.— Бунт Моці-Гёджа, Мн., 1927; Рыкі-Цікі-Таві, Мн., 1938; Казкі, Мн., 1939; Маўглі, Мн., 1940.

КІПР (Рэспубліка Кіпр), даяржава на аднайменным в-ве ў усх. частцы Міжземнага мора. Пл. 9251 *км*². Нас. 633 тыс. чал. (1970). Падзяляецца на 5 акруг. Сталіца Нікасія. К.— рэспубліка. Уваходзіць у склад Садружнасці нацый на чале з Вялікабрытаніяй. Дзейнічае канстытуцыя 1960, падпісаная змешанай камісіяй (прадстаўнікамі Вялікабрытаніі, Грэцыі і Турцыі) на аснове Цюрыхска-Лонданскіх пагадненняў 1959. Вышэйшы заканадаўчы орган — палата прадстаўнікоў, якая выбіраецца на 5 гадоў. Выканаўчую ўладу ажыццяўляе прэзідэнт (грэк), віцэ-прэзідэнт (турак) і ўрад з 10 міністраў (7 грэкаў і 3 туркі).

Прырода. Паўднёвая частка К. занята горным хрыбтом Траодас (найб. выш. 1951 *м*), паўночная — хрыбтамі Кірэнія і Карпас. Паміж гарамі з З на У цягнецца паката-хвалістая раўніна. Клімат субтрапічны, міжземнаморскі. Сярэдняя т-ра студз. 9,5—12, жн. 26—28 °С. Ападкаў 300—600 *мм*, у гарах да 1000 *мм* за год. Рэчышчы запаўняюцца водою толькі пасля зімовых дажджоў. Расліннасць: да выш. 500 *м* вечназялёныя хмызнякі, вышэй лясы з дубу, кіпарысу, алепскай хвоі.

Насельніцтва. Грэкі (78%), туркі (18%) і інш. Афіц. мовы грэчаская і турэцкая. Рэлігія праваслаўная і іслам. Сярэдняя шчыльн. 68,4 чал. на 1 *км*², гарадскога нас. 37%. Найб. гарады Нікасія, 112 тыс. ж. (1969); Лімасол, Фамагуста.

Гістарычная даведка. На тэр. К. выяўлены рэшткі неалітычных паселішчаў. У 2-м тысячагоддзі да н. э. былі раннерабаўладальніцкія гарады-дзяржавы. Зручнае геагр. становішча К., багатыя паклады медзі вабілі замежных заваёўнікаў. У розны час на в-ве панавалі ахейцы, фінікійцы, асірыйцы, егіпцяне, рымляне, арабы, крыжакі і інш. З 1489 належаў Венецыі. У 1571 К. захапіла Турцыя. У 1878 акупаваны, у 1914 анексіраваны Вялікабрытаніяй. Кіпрыёты ніколі не спынялі барацьбы за вызваленне. У 1926 засн. Камуніст. партыя К. (з 1941 Прагрэсіўная партыя працоўнага народа — АКЭЛ). У 1960 К. абвешчаны незалежнай рэспублікай, прыняты ў ААН. Аднак паводле Цюрыхска-Лонданскіх пагадненняў 1959 Вялікабрытанія захавала на К. ваен. базы. Дагавор «Аб саюзе» дазволіў Грэцыі і Турцыі ўвесці на К. свае войскі. Спробы кіпрскага ўрада і прагрэс. сіл рэспублікі пазбавіцца ад несправядлівых дагавору і пагадненняў выклікаюць супраціўленне імперыял. колаў НАТО, якія з падтрымкай унутр. рэакцыі імкнуцца ліквідаваць рэспубліку на К., ператварыць яго ў ваен. базу НАТО. У 1963 яны справакавалі ўзбр. канфлікт паміж грэч. і тур. насельніцтвам в-ва. Паводле рашэння Савета Бяспекі ў 1964 на К. уведзены войскі ААН. Прагрэс. сілы К. на чале з АКЭЛ змагаюцца за поўную незалежнасць, суверэнітэт і тэрытарыяльную цэласнасць краіны, за вывад усіх замежных войск і ліквідацыю ваен. баз, за арыентацыю міжнар. імперыялізму і ўнутр. рэакцыі. Дыпламат. адносіны з СССР устаноўлены ў 1960.



Нікасія. Агульны выгляд.

Гаспадарка. Асн. занятак насельніцтва — земляробства і жывёлагадоўля; на ўзбярэжжы рыбалоўства. Вырошчваюць віноград, цытрусавыя, салодкі ражок, бавоўнік, аліўкавыя, тытунь, бульбу, са збожжавых — ячмень, пшаніцу, кукурузу. У 1969 сабрана (тыс. *т*): ячменю 130, пшаніцы 100. У 1969 было (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 40, свіней 130, авечак 420, коз 325. Здабыўная прамысловасць (жалезныя і медныя руды, хром, азбест, умбра, гіпс і інш.) у руках замежнага (ЗША і Вялікабрытаніі) капіталу. Ёсць невялікія абутковыя, швейныя, тэкст. і апрацоўчыя прадпрыемствы. Важная роля ў эканоміцы К. належыць замежнаму турызму і знешняму гандлю (з Вялікабрытаніяй, ФРГ, Італіяй і інш.). Транспарт аўтамабільны. Даўж. дарог (1967) 8060 *км*, у т. л. з цвёрдым пакрыццём 3436 *км*. Праз К. ідуць магістральныя паветр. лініі, якія злучаюць блізкаўсходнія, паўночнаафрыканскія і еўрап. краіны. Грашовая адзінка — кіпрскі фунт.

Асвета. Урад К. робіць захады да пашырэння асветы. Уведзена абавязковае навучанне для дзяцей ад 5 гадоў і 6 месяцаў да 14 гадоў. Школы грэч. і турэцкія. Навучанне ў грэч. школах адпавядае праграмам школ Грэцыі, у турэцкіх школах — праграмам школ Турцыі. Пач. школу наведвае 97% дзяцей. Сярэдняя школа і сярэдняя прафесійнатэхн. падрыхтоўка 6-гадовая. У 1969/70 навуч. г. ў сістэме грэч. навуч. устаноў займалася: у пач. школах 70,1 тыс., у сярэдніх школах 34,9 тыс. вучняў, у прафес.-тэхн. навуч. установах 4,1 тыс. чал. У сістэме тур. навуч. устаноў (1965/66 навуч. г.) займалася: у пач. школах 16,7 тыс. вучняў, у сярэдніх школах і прафес.-тэхн. навуч. установах 7,6 тыс. чал. Б-кі: Публічная, пед. коледжа (акадэмій), мін-ва асветы — усе ў Нікасіі. Музеі: Музей Кіпра, нац. рэліквій, нар. мастацтва, Турэцкі музей, Лапідарый (усе ў Нікасіі), археал. музей у Пафасе, музеі ў Лімасоле, Ларнацы, Фамагусце.

Літ.: Леонидов С. М. Кипр в борьбе за независимость, М., 1963; Уразова Е. И. Кипр., М., 1966; Кипр. (Справочник), М., 1969.

Г. Я. Рылюк (прырода, гасп.). Мінск; *У. З. Клепікаў* (асвета). Масква.

КІПРЭГЕЛЬ (ням. kippen абарочваць+Regel лінейка), геадэзічны інструмент, які ў камплексе са столікам-мензулай служыць для тапаграфічнай здымкі мясцовасці.

К.-аўтамат (гл. рыс. 3 у арт. *Геадэзічныя інструменты*) мае метал. лінейку, на якой замацаваны кранштэйн са зрокавай

трубой і шкляным верт. кругам. На крузе — дзялення для вымярэння верт. вуглоў, дыяграма крывых для адліку гарыз. адлегласцей і перавышэнняў па рэйцы з сантыметровымі дзяленнямі.

КІПРЭНСКІ Арэст Адамавіч [13(24).3.1782, мыза Нежынская каля Капор'я Араніенбаўмскага пав. Пецярбургскай губ.—5(17).10.1836], рускі жывапісец і рысавальшчык. Адзін з выдатных майстроў рэаліст. партрэта ў рус. і сусв. жывапісе і графіцы 1-й пал. 19 ст. Скончыў Пецярбургскую АМ у 1803. Працаваў у Маскве (1809), Цверы (1811), Пецярбурзе (з 1812); у 1816—22 і з 1828 жыў у Рыме і Неапалі. Партрэтам К. ўласцівыя лірызм, душэўная цеплыня, рамант. прыўзнятасць, дакладнасць і выразнасць малюнка (партрэты А. К. Швальбе, 1804; Я. В. Давыдава, 1809; К. П. Растапчынай, 1809; хлопчыка Чэлішчава, каля 1809; Д. М. Хвастовай, 1814; А. С. Пушкіна, 1827; аўтапартрэты, 1808, 1828). Аўтар серыі алоўкавых партрэтаў удзельнікаў Айч. вайны 1812 (Я. І. Чапліца, А. Р. Тамілава, М. П. і А. П. Лапскіх, П. А. Аленіна) і прыгонных («Сляпы музыкант», 1809; «Калмычка Баяуста», 1813; «Сялянскі хлопчык Андрэйка», 1814). Іл. гл. на ўкл. да арт. *Аўтапартрэт* і *Графіка* (укл. II).



Літ.: Ацаркина Э. Н. Орест Кипренский, М., 1948; Поспелов Г. (сост.). Портретные рисунки О. Кипренского, М., 1960; Кипренский-портретист, Л., 1967.

КІР II Вялікі (грэч. Kýros, стараж.-перс. Куруш), цар старажытнаперсідскай дзяржавы [558—530 да н. э.]. З дынастыі Ахеменідаў. У 558 да н. э. ўзначаліў паўстанне перс. плямёнаў супраць панавання Мідыі, якое скончылася перамогаю (550 да н. э.). Мідыя з часткаю залежных ад яе абласцей увайшла ў склад *Ахеменідаў дзяржавы*. У 546 да н. э. перс. войскі захапілі Лідыю (яе сталіцу Сарды, скарбы легендарнага цара Крэза). У 538 да н. э. скончылася перамогай паступовае наступленне на Вавілонію. Вавілон стаў адной з рэзідэнцый К. II (прыняў тытул «цар Вавілона, цар краін»). Загінуў у час вайны з плямёнамі масагетаў у Сярэдняй Азіі.

КІРАВА (да 1939 Лукаеды), вёска ў Брагінскім р-не Гомельскай вобл. Падпарадкоўваецца Камарынскаму гарпасяльковаму Савету. Цэнтр калгаса імя Кірава. За 57 *км* на ПдУ ад Брагіна, 182 *км* ад Гомеля, 14 *км* ад чыг. ст. Ёлча, 5 *км* ад Дняпра. 702 ж., гасп. 235 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі, магазін. У 1943 вёску часткова спалілі нямец.-фаш. захопнікі, загубілі 18 мірных жыхароў, на іх брацкай магіле помнік.

КІРАВА (да 1939 Свята е), вёска ў Жлобінскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Свярдлова. За 29 *км* на У ад Жлобіна, 78 *км* ад Гомеля, 14 *км* ад чыг. ст. Салтанаўка. 678 ж., двароў 265 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, швейная майстэрня, сталовая, магазін. У снеж. 1943 вёску часткова спалілі нямец.-фаш. захопнікі. Помнік на брацкай магіле 81 сав. воіна Айч. вайны.

КІРАВАБАД (да 1804 і ў 1918—35 Ганджа, у 1804—1918 Елізаветполь), горад рэсп. падпарадкавання ў Азерб. ССР, на р. Гянджачай (бас. Куры). Засн. ў 5—6 ст. Чыг. станцыя. 192 тыс. ж. (1971). Перайменаваны на ўшанаванне памяці С. М. Кірава. К.— другі пасля Баку прамысл. цэнтр Азербайджана. Прамысловасць лёгкая (тэкст. камбінат, суконная і швейная ф-кі, бавоўнаачышчальны з-д) і харч. (масла-тлушчавы і мясны камбінаты, вінаробны і масласырзаводы). Вытворчасць буд. матэрыялаў. Мех. з-д (запчасткі для с.-г. машын). Гліназёмны з-д. ЦЭЦ. Непадалёку ад К. Зурнабадская ГЭС. С.-г. і пед. ін-ты, філіял Азерб. політэхн. ін-та, 7 сярэдніх спец. навуч. устаноў. Драм. тэатр. Краязнаўчы музей. Маўзалей Нізамі.

КІРАВАГРАД (да 1924 Елізаветград, у 1924—34 Зіноўеўск, у 1934—39 Кірава), горад, цэнтр Кіраваградскай вобл. УССР, на р. Інгул (прыток Паўд. Буга). Засн. ў 1754. Чыг. станцыя. 195 тыс. ж. (1971). Перайменаваны ў гонар С. М. Кірава. Машынабудаванне і металаапрацоўка (з-ды с.-г. машын, трактарных гідраагрэгатаў, вагавымяральных прылад і інш.). Прамысловасць харчовая (алейна-тлушчавы, мясны, малочны, хлебны камбінаты, лікёра-гарэлачны і піваварны з-ды), лёгкая (швейная, панчошна-шкарпэткавая, абутковая ф-кі), дрэваапрацоўчая і буд. матэрыялаў. Ін-ты пед. і с.-г. машынабудавання, 8 сярэдніх спец. навуч. устаноў. Драм. тэатр, філармонія. Краязнаўчы музей.

КІРАВАГРАДСКАЯ ВОБЛАСЦЬ, у складзе УССР. Утворана 10.1.1939. Размешчана паміж Дняпром і Паўд. Бугам. Пл. 24,6 тыс. км². Нас. 1264 тыс. чал. (1971). Падзяляецца на 21 раён; 11 гарадоў, 24 гар. пас. Цэнтр. г. Кіраваград.

У межах К. в. паўд. частка Прыдняпроўскага ўзвышша, выш. да 269 м. Паверхня хвалістая, парэзаная рачнымі далінамі і ярамі. Карысныя выкапні: буры вугаль, графіт, нікелевая руда, буд. матэрыялы, торф, жал. руда. Клімат умерана кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. −5,4; −6,5, ліп. 20; 21,5 °С. Ападкаў 418—476 мм за год. Вегет. перыяд 200—210 дзён. Гал. рэкі Дняпро (з прытокам Інгулец), Інгул і Паўд. Буг (з прытокам Сінюха), Крамянчугскае і інш. вадасховішчы. Глебы пераважна чарназёмныя, на Пн ападзоленыя чарназёмы, цёмна-шэрыя, шэрыя і светла-шэрыя. Пад лесам (дуб, граб, клён, ясень) і хмызнякамі 4,7% тэр. Асн. насельніцтва ўкраінцы, жывуць рускія, беларусы і інш. Сярэдняя шчыльн. 51,4 чал. на 1 км². Гарадскога нас. 45%. Найб. гарады: Кіраваград, Александрыя, Светлаводск, Знаменка.

Найб. развіта харчовая, машынабуд., металаапрацоўчая, паліўная, электраэнергетычная прамысловасць. 10 цукр. з-даў (найб. ў Далінскай, Александрыі, Новаўкраінцы), алейна-тлушчакамбінат у Кіраваградзе, мясакамбінаты, мукамольныя і спірт. з-ды, масларобныя і сыраварныя прадпрыемствы ў Кіраваградзе, Александрыі і інш. Машынабудаванне (з-ды с.-г. машын, трактарных гідраагрэгатаў


КІРАВАГРАДСКАЯ ВОБЛАСЦЬ
Маштаб 12 500 000
0 25 50 км
Звенігародка
Ватутіна
Папужынцы
Юркоўка
Кацярынаслаль
Крымка
Мокрая Калігарка
Тальное
Іванаўка
Старыя Бабаны
Харціншчына
Верхнячка
Таталашова
Умань
Свяглавая
Надлак
Новаархангельск
Малая Вісь
Новавазнясенск
Гаўрыла
Цыбулеўка
Гаўрыкова
Хмялёвае
Царнобука
Гладосы
Крупскае
Пляцень Ташлык
Захараўка
Новаўкраінка
Пясчаны Брод
Любамірка
Памашная
Ольшанка
Падгародная
Першамайск
Новакрасная
Благадатнае
Арбузінка
Мікала-Бабанка
Бобрынец
Вялікая
Крымчаватая
Сцяпанаўка
Кіраваград
Новая Прага
Александрыя
Знаменка
Субатцы
Пантаеўка
Іванаўка
Касаўка
Праценкаўка
Багданаўка
Навамірград
Каміх
Асіпаўка
Высокія Байракі
Марынаўка
Грузскае
Аджамка
Фёдараўка
Германаўка
Сасоўка
Кучоўка
Нятрова
Варварацка
Гайдамацкае
Іскрацкае
Жоўтыя Воды
Пашкаты
Сонцаўка
Сухарэўка
Мікалаеўка
Ганнаўка
Ганнаўка
Ганна

якія выконваюцца, забяспечвае таксама расшыфроўку чарговай каманды праграмы, перадачу неабходных лікаў у *арыфметычны блок*, арганізуе выкананне вызначанай у камандзе аперацыі, перадае атрыманы вынік вылічэння ў магнітны аператыўны запамінальны блок і захоўвае яго на рэгістрах, падрыхтоўвае нумар ячэйкі, у якой захоўваецца чарговая каманда. Цэнтральны К. б. машыны «Мінск-32» забяспечвае работу машыны па 4 праграмах адначасова.

Літ.: Китов А. И. и Криницкий Н. А. Электронные вычислительные машины, 2 изд., М., 1965; Марголин М. С., Наденеико В. К. и Смирнов Г. Д. Электронная вычислительная машина «Минск-22», Мн., 1969.

Л. М. Жайрыд. Мінск.

КІРАВАЛЬНЫЯ ВЫКАПНІ (кіравальныя формы), рэшткі выкапнёвых арганізмаў і раслін, пашыраныя на вял. плошчы і характэрныя адкладам пэўнага геал. ўзросту. Вял. гарызантальнае і малое вертыкальнае пашырэнне К. в. дае магчымасць дакладна супастаўляць пласты (гл. *Карэляцыя стратыграфічная*) у значна аддаленых адзін ад аднаго пунктах, вызначаць іх адносны ўзрост і падзяляць тоўшчу асадкавых парод на групы, сістэмы, аддзелы, ярусы.

Адны К. в. вызначаюць невялікія стратыграфічныя адзінкі (напр., аманіты — зоны юрскай сістэмы, грапталіты — ардовікскай і сілурыйскай); другія — узрост больш значных адзінак геал. часу (напр., брахіяподы — палеазойскую сістэму, фарамініферы — ад сілурыйскай да чацвярцічнай). Кіравальным можа быць від, род ці нават сямейства.

Літ.: Гл. пры арт. *Палеанталогія.*

КІРАВА́ННЕ, сувязь і залежнасць элементаў, функцый, стану дзейнасці, арганізаваных (кібернетычных) сістэм, што дае магчымасць захаваць іх структуру, забяспечыць дасягненне пэўнай мэты пры мэтанакіраваным узаемадзеянні элементаў сістэмы кіравання ў цэлым. Сутнасць К.— у дасягненні мэты, амест яго — упарадкаваная змена кіроўнага аб'екта ў адпаведнасці з гэтай мэтай. Сістэма К. ўключае кіравальную (кібернетычную) сістэму, кіроўны аб'ект і інфармацыйныя каналы прамой і зваротнай сувязі. Найважн. лагічны выходны прынцып К.— прынцып арганічнага адзінства К., інфармацыі і зваротнай сувязі. Выкарыстанне прынцыпу зваротнай сувязі ў працэсах К. і рэгулявання магчыма дзякуючы мэтазгоднасці структуры і функцыі ўсіх элементаў кібернетычнай сістэмы, яе агульнай арганізацыі, мэтанакіраванай упарадкаванасці. Гэта дае магчымасць карэкціраваць наступныя дзеянні ў залежнасці ад вынікаў папярэдніх, ад стану кіроўнага аб'екта. Прыклады кіравальных сістэм: у тэхніцы — кіравальныя электронныя машыны; у жывой прыродзе — арганізм любой складанасці; у грамадстве — мін-ва, дырэкцыя, ведамства і ўсякая іншая грамадская арг-цыя.

Да стварэння *кібернетыкі* асобныя моманты К. разглядаліся ў старажытнасці дастасавальна да сацыяльных (палітычных) сістэм (Платон). У 18—19 ст. сацыялістамі-утапістамі ставілася пытанне аб планавай арганізацыі грамадства. Кібернетыкі выдзелілі К. як асобны аб'ект даследавання. Кіравальная сістэма мэтанакіравана ўздзейнічае на кіроўны аб'ект шляхам карэкціравальнай інфармацыі, якая перадаецца па канале прамой сувязі. Канал зваротнай сувязі служыць для своечасовага атрымання асведамляльнай інфармацыі пра змены ў стане кіроўнага аб'екта. Структура кібернетычнай сістэмы прадугледжвае абавязковую іерархію падсістэм і элементаў, не толькі іх каардынацыю, але і субардынацыю, а таксама прынцып узмацнення, без якога не абыходзіцца ніводзін працэс К. З прычыны шмат'яруснасці і складанасці сістэм К. адрозніваюць унутранае К. і вонкавае, хоць розніца паміж імі адносная. Адрозніваюць таксама шэраг відаў К. паводле спецыфікі кібернетычных сістэм у грамадстве, жывой прыродзе, тэхніцы. Кожны з гэтых відаў К. мае свае асаблівасці. Найпрасцейшы від К.— рэгуляванне. Яно разглядаецца як выпадак К., калі мэта сістэмы ў тым, каб падтрымаць больш ці менш пасталінным пэўны параметр сістэмы, якая рэгулюецца (рэгуляванне па скорасці, тэмпературы і г. д.). У нежывой аб'ектыўнай прыродзе існуюць толькі перадумовы К. ў выглядзе заканамернасцей развіцця матэрыяльнага свету. З узнікненнем жыцця гэтая патэнцыяльная магчымасць рэалізуецца ў арганізмах. З пункту погляду кібернетыкі арганізм — сукупнасць вял. колькасці ўзаемазвязаных сістэм рознага ўзроўню, дзе гал. ролю рэгуляцыі выконвае цэнтр. нервовая сістэма. Рэгуляванне ажыццяўляецца з выкарыстаннем адмоўнай зваротнай сувязі мозгам, падкоркай і рэгулятарамі розных гамеастатычных сістэм. У выпадку ўнутранай (узнікненне паталагічных працэсаў у арганізме) ці вонкавай небяспекі мозг «умешваецца» ў працэсы рэгуляцыі іншых сістэм. Такое кіравальнае ўздзеянне мозгу забяспечвае мабілізацыю ўсіх рэсурсаў і магчымасцей арганізма. Ступеньчатае К. і рэгуляванне ў арганізме надзвычай мэтазгоднае і эканамічнае. Яго прынцыпы шырока выкарыстоўваюцца ў сацыяльным К., якое з'яўляецца найбольш складаным відам К. У грамадскай вытворчасці ёсць вышэйшыя і нізавыя звенні (гл. *Кіраванне вытворчасцю*).

Сацыяліст. сістэма дае магчымасць навуковага К. развіццём грамадства. Праблемы арганізацыі такога К. ўпершыню навукова распрацаваны марксізмам-ленінізмам і паспяхова практычна ажыццяўляюцца ў СССР і ў інш. краінах сацыялізма. Гл. таксама *Сістэма.*

Літ.: Маркс К. Капітал, т. 1, Мн., 1952, т. 3, Мн., 1953; Энгельс Ф. Анты-Дзюрынг, Мн., 1952; Ленін У. І. Чарговыя задачы Савецкай улады, Тв., т. 27 (Полн. собр. соч., т. 36); Афанасьев В. Г. Научное управление обществом, М., 1968; Берг А. И. Кибернетика — наука об оптимальном управлении, М.—Л., 1964; Гвишиани Д. М. Организация и управление, М., 1970; Жуков Н. И. Философские основы кибернетики, Мн., 1970.

М. І. Жукаў. Мінск.

КІРАВА́ННЕ (у граматыцы), від сінтаксічнай сувязі, пры якой галоўнае (усякае самастойнае) слова абумоўлівае форму залежнага (назоўніка або інш. слова ў значэнні назоўніка).

К. бывае непасрэднае, або беспрыназоўнікавае («люблю дзяцей»), і пасрэднае, або прыназоўнікавае («клапачуся пра дзяцей»). Сярод абодвух відаў вылучаюць яшчэ моцнае К.— калі гал. слова патрабуе ад залежнага строга акрэсленай формы («апяваць гераізм»; «адмовіцца ад сваіх слоў»), і слабае — калі гал. слова спалучаецца з рознымі формамі залежнага слова («ісці ад брата, к брату, з братам»).

КІРАВА́ННЕ ВОЙСКАМІ, пастаянная творчая дзейнасць камандзіраў па кіраўніцтве арганізацыяй, падрыхтоўкай і вядзеннем бою падначаленых войск. Адзін з найважн. элементаў ваен. майстэрства.

Уключае: падтрыманне высокага палітычна-маральнага стану і пастаяннай баявой гатоўнасці войск; прыняцце камандзірамі рашэнняў і хуткую пастаноўку баявых задач; арг-цыю бесперапыннага аператыўнага і тактычнага ўзаемадзеяння войск і іх усебаковага забеспячэння; кантроль за выкананнем рашэнняў і інш. мерапрыемстваў, накіраваных на дасягненне пастаўленых баявых задач. Асн. патрабаванні да К. в.: цвёрдасць, бесперапыннасць, аператыўнасць, скрытнасць ад праціўніка.

КІРАВА́ННЕ ВЫТВОРЧАСЦЮ, сістэма рэгулявання і каардынацыі дзейнасці прадпрыемстваў, у сацыяліст. краінах таксама і галін гаспадаркі, развіцця ўсёй эканомікі ў адпаведнасці з вызначанай мэтай. Сутнасць залежыць ад спосабу вытворчасці. Засн. на перапрацоўцы інфармацыі, прыняцці і перадачы падначаленым кіраўніцкіх рашэнняў, кантролі за іх выкананнем. Складаецца з вышэйшых і нізавых звенняў, якія ў сукупнасці ўтвараюць структуру *кіравання.* Паводле характару дзейнасці кіраўнікі падзяляюцца на аператыўных (лінейных), якія ажыццяўляюць агульнае кіраванне, і інжынерных (функцыянальных), якія павінны ўкараняць у вытворчасць дасягненні навукі, тэхнікі і перадавой практыкі. Эфектыўнасць К. в. павышаюць аргтэхніка, *аўтаматызаваныя сістэмы кіравання вытворчасцю, графічныя метады ў кіраванні вытворчасцю, дыспетчарызацыя, сеткавае планаванне, эканоміка-матэматычныя метады.*

Аб'ектыўная неабходнасць К. в. выклікана развіццём прадукцыйных сіл, паглыбленнем грамадскага падзелу працы і ле кааперацыі. У дакапіталіст. фармацыях функцыі кіравання выконвалі асобы, якія адначасова займаліся і фізічнай працай. Капіталіст. кааперацыя працы адасобіла К. в., ператварыла яго ў самастойны від дзейнасці. Спачатку прадпрыемствамі кіравалі самі капіталісты. Пазней гэтыя функцыі пачалі перадаваць менеджэрам. У гэтым бурж. эканамісты бачаць адзін з аргументаў перараджэння капіталізму: нібыта вытворчасцю кіруюць не капіталісты, а прадстаўнікі народа. На справе ж К. в. пры капіталізме мае двоесны характар. З аднаго боку, яно садзейнічае росту прадукцыйнасці працы, павышэнню эфектыўнасці вытворчасці. Але, з другога боку, робіцца гэта дзеля інтарэсаў уласнікаў сродкаў вытворчасці, манаполій; менеджэры — стаўленікі капіталістаў, дзейнічаюць ад іх імя і на іх карысць. Таму ў адносінах да працоўных К. в. пры капіталізме мае дэспатычны характар. Яно злучае працоўных са сродкамі вытворчасці толькі праз эксплуатацыю. Адсюль пастаянны антаганізм паміж уладальнікамі прадпрыемстваў (менеджэрамі) і працоўнымі. Высокая ступень аграмаджвання вытворчасці ва ўмовах імперыялізму стварае перадумовы арганізацыі планавага К. в. ў маштабе ўсёй краіны, але з-за прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці гэтая магчымасць лакалізуецца ў рамках асобных прадпрыемстваў. «Планаванне» і «прагназаванне», што ажыццяўляюць бурж. дзяржавы, нічога агульнага не маюць з сацыяліст. планавым кіраваннем эканомікай.

Пры сацыялізме кіраванне арганічна злучае працоўных са сродкамі вытворчасці, бо гаспадары гэтых сродкаў — самі працоўныя. Грамадская ўласнасць на сродкі вытворчасці стварае магчымасць навуковага К. в. ў маштабе ўсёй краіны. К. в. набывае прынцыпова новыя мэты, формы і метады: яму характэрна таварыскае супрацоўніцтва кіраўнікоў і падначаленых; мэта яго — павышэнне эфектыўнасці вытворчасці дзеля інтарэсаў працоўных. У адрозненне ад К. в. на капіталіст. прадпрыемствах, дзе арганізацыйна-тэхн. і сацыяльны бакі процілеглыя, на сацыяліст. прадпрыемствах яны арганічна ўзаемазвязаны. Вытворчыя поспехі прадпрыемстваў даюць магчымасць паспяхова вырашаць сац. праблемы, а рост дабрабыту і культ. ўзроўню працоўных — важная эканам. ўмова развіцця вытворчасці. Дзярж. абавязак кожнага кіраўніка сацыяліст. прадпрыемства — вырашаць не толькі вытворчыя, а і сацыяльныя праблемы, ажыццяўляць планамернае сац. развіццё працоўнага калектыву. Вырашальнай асаблівасцю кіравання сацыяліст. вытворчасцю з'яўляецца кіраўніцтва камуніст. партыі, якая выражае карэнныя інтарэсы працоўных, навукова абгрунтоўвае праграму эканам. развіцця, мабілізуе масы на дасягненне вызначанай мэты. Арганізацыю навуковага К. в. У. І. Ленін лічыў адной з гал. умоў развіцця і перамогі сацыяліст. эканомікі. Ён распрацаваў прынцыпы К. в., якія з'яўляюцца асновай навукі кіравання сацыяліст. вытворчасцю. Гал. прынцыпы: адзінства гасп. і паліт. кіраўніцтва (прадугледжвае абавязковы паліт. падыход да вырашэння гасп. пытанняў), *дэмакратычны цэнтралізм, адзінаначалле* і выкарыстанне вопыту, ініцыятывы мас (гл. *Грамадскія формы кіравання вытворчасцю*), *планаванне народнай гаспадаркі, гаспадарчы разлік* і матэрыяльная зацікаўленасць (гл. *Эканамічнае стымуляванне*), падбор, расстаноўка і выхаванне кадраў (гл. *Кадры*), улік і кантроль. У. І. Ленін вызначыў таксама рысы, якія павінен мець кіраўнік сацыяліст. вытворчасці: паліт. загартоўка, кампетэнтнасць, добрасумленнасць, прынцыповасць, арганізатарскія здольнасці. Ленінскія прынцыпы К. в. творча развіваюцца на практыцы. Роля К. в. асабліва павялічваецца ў перыяд стварэння мат.-тэхн. базы камунізма, калі з ростам маштабаў вытворчасці, з развіццём навук.-тэхн. прагрэсу рацыянальная каардынацыя і рэгуляванне вытворчасці становяцца найважнейшымі сродкамі эфектыўнага выкарыстання матэр. і прац. рэсурсаў. Таму ўдасканаленне сістэмы кіравання эканомікай XXIV з'езд КПСС паставіў як адно з вузлавых пытанняў эканам. палітыкі партыі. Асабліва важнае значэнне набывае паляпшэнне планавання, арганіз. структуры кіравання, узмацненне эканам. стымулаў, шырокі ўдзел працоўных у К. в. Партыя лічыць, што навука кіраваць — гэта навука перамагаць. Каб павысіць эфектыўнасць К. в., ствараецца сістэма падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кіраўніцкіх кадраў, удасканальваецца тэхніка для механізацыі кіравання, павялічваецца яе вытворчасць, шырэй укараняюцца эканам. метады і навук. арганізацыя кіравання.

Літ.: Маркс К. Капітал. т. 1, Мн., 1952, т. 3, Мн., 1953; Энгельс Ф. Аб аўтарытэце, Мн., 1951; Маркс К. и Энгельс Ф. Выбраныя творы, т. 1, Мн., 1951; Ленін У. І. Чарговыя задачы Савецкай улады, Тв., т. 27 (Полн. собр. соч., т. 36); Ленин В. И. Об авторитете руководителя, М., 1963; Дронь П. П., В. И. Ленин о руководстве народным хозяйством, Мн., 1971; Козлова О. В. и Кузнецов И. Н. Научные основы управления производством, М., 1970; Планирование и управление народным хозяйством в социалистических странах, М., 1969; НОТ в управлении совхозов и колхозов, М., 1971; Курс для высшего управленческого персонала, пер. с англ., М., 1970.

У. А. Саламовіч. Мінск.

КІРАНКОЎ Цімафей Пятровіч [20.6(3.7).1907, с. Ямское Баравіцкага пав. Ноўгарадскай губ.— 1946], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). На фронце з 1941, камандзір аддзялення. Вызна-

чыўся ў Камарынскім р-не Палескай вобл. 27.9.1943 пры пераправе боепрыпасаў цераз Дняпро варожы снарад разбіў плыт. К. уплаў даставіў боепрыпасы і харчы байцам. З яго ўдзелам адбіта 17 контратак.

КІРАСІРЫ (франц. адз. л. cuirassier), конныя цяжкай кавалерыі ў рус. і зах.-еўрап. арміях 17—20 ст., якія насілі кірасы (латы).

КІРАЎ (Кострыкаў) Сяргей Міронавіч [15(27).3.1886, Уржум Вяцкай губ.— 1.12.1934], дзеяч Камуніст. партыі і Сав. дзяржавы. З беднай сям'і, з 7 гадоў у дзіцячым прытулку. Чл. КПСС з 1904. У 1901—04 вучыўся ў Казанскім механіка-тэхн. вуч., дзе ўключыўся ў рэвалюц. рух. Актыўны ўдзельнік рэвалюцыі 1905—07. Вёў парт. работу ў Томску, Іркуцку, Уладзікаўказе. За рэвалюц. дзейнасць у 1905, 1906—08, 1911—12 зняволены ў турмах. Пасля Лют. рэв. 1917 чл. Уладзікаўказскага Савета, дэлегат II Усерас. з'езду Саветаў. Удзельнічаў у Кастр. узбр. паўстанні ў Петраградзе. Кіраўнік барацьбы за ўстанаўленне Сав. улады на Паўн. Каўказе. У 1919 старшыня ВРК Астраханскага краю, чл. Рэўваенсаветаў 11-й арміі, паўд. групы войск Чырв. Арміі, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў абароны Астрахані. З мая 1920 паўнамоцны прадстаўнік РСФСР у Грузіі; кіраўнік сав. дэлегацыі на папярэдніх мірных перагаворах РСФСР і Польшчы ў Рызе (кастр. 1920). З ліп. 1921 да снеж. 1925 сакратар ЦК КП Азербайджана; адзін з заснавальнікаў ЗСФСР. З лютага 1926 першы сакратар Ленінградскага губкома (з 1927 абкома) і адначасова Паўд.-Зах. бюро ЦК ВКП(б). Цвёрда і рашуча вёў барацьбу супраць троцкістаў, зіноўеўцаў, бухарынцаў і інш. апартуністаў, за адзінства партыі, ажыццяўленне ленінскага плана пабудовы сацыялізма ў СССР. На X, XI з'ездах РКП(б) выбраны канд. у чл. ЦК, на XII—XVII з'ездах ВКП(б) — чл. ЦК; канд. у чл. Палітбюро з 1926, чл. Палітбюро ЦК ВКП(б) з 1930. З лютага 1934 сакратар і чл. Аргбюро ЦК ВКП(б). Быў чл. ВЦВК, ЦВК, Прэзідыума ЦВК СССР. Забіты ворагамі. Узнаг. ордэнам Леніна і ордэнам Чырв. Сцяга. Яго імем названы былі г. Вятка, гар. пас. у Магілёўскай вобл., многія гарады, вёскі, калгасы ў СССР.



Тв.: Избр. статьи и речи (1912—1934). М., 1957; О народном просвещении и воспитании, М., 1969; бел. пер.— Аб моладзі, Мн., 1949.

Літ.: Красников С. Сергей Миронович Киров. Жизнь и деятельность, М., 1964; Голубева А. Хлопчык з Уржума, Мн., 1953.

КІРАЎ (да 1780 Хлынаў, у 1780—1934 Вятка), горад, цэнтр Кіраўскай вобл. РСФСР, на левым беразе р. Вяткі. Засн. ў канцы 12 ст. Чыг. вузел, прыстань. 340 тыс. ж. (1971). Перайменаваны на ўшанаванне памяці С. М. Кірава. Найб. прадпрыемствы: машынабуд. з-д «1 Мая», шынны, інструментальны; ф-кі запалкавая «Чырвоная зорка», швейная, «Піяніна»; камбінаты тэкстыльны, гарбарна-футравы, гарбарна-абутковы, штучнай скуры, па вырабе навучальна-тэхн. і школьнага абсталявання, домабуд.-мэблевы. Прадпрыемствы дрэваапр. і харч. прамысловасці. Апрацоўка каляровых металаў. Політэхн., с.-г., пед. ін-ты; 8 сярэдніх спец. навуч. устаноў. 3 тэатры, філармонія. Краязнаўчы і маст. музеі.

КІРАЎ (Кірава, да 1939 Махаеды), вёска ў Нараўлянскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Кіраўскі». За 38 *км* на ПдЗ ад Нароўлі, 216 *км* ад Гомеля, 17 *км* ад чыг. ст. Вільча, на аўтамаб. дарозе, якая злучае вёску з Нароўляй. 1519 ж., двароў 440 (1971). Смалазавод, лясніцтва, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, аптэка, аддз. сувязі, 5 магазінаў. У 1943 вёску спалілі нямфаш. захопнікі. Помнік на брацкай магіле 4 сав. воінаў і 2 партызанаў Айч. вайны.

КІРАЎСК, гар. пасёлак (з 1959), цэнтр Кіраўскага р-на Магілёўскай вобл. На р. Ала, за 87 *км* на ПдЗ ад Магілёва, 25 *км* ад чыг. ст. Бярэзіна. 4,7 тыс. ж. (1971). Прамысл.



Кіраўск. Вуліца Гагарына.

прадпрыемствы: філіял Бабруйскага малочнага з-да, прамкамбінат, агароднінасушыльны з-д, ільнозавод, камбінаты буд. матэрыялаў і быт. абслугоўвання. Раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі, спецыялізаванае аддз. Сельгастэхнікі. 2 сярэднія школы, 4 дзіцячыя сады, 2 масавыя б-кі, Дом культуры, кінатэатр, бальніца. Брацкая магіла сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны.

Вырас з невялікай в. Старцы і перайменаваны ў 1935 на ўшанаванне памяці С. М. Кірава. З ліп. 1941 да чэрв. 1944 акупаваны нямфаш. захопнікамі. Нямк. акупанты загубілі 152 мірных жыхароў К.

КІРАЎСКАЕ (да 1961 Дзікае), пасёлак у Глускім р-не Магілёўскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 12 *км* на ПнУ ад Глуска, 156 *км* ад Магілёва, 38 *км* ад чыг. ст. Бярэзіна (у Бабруйску), каля аўтамаб. дарогі Глуск — Бабруйск (0,2 *км*). 378 ж., гасп. 111 (1971). Торфапрадпр. «Кіраўскае». Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, 2 магазіны.

КІРАЎСКАЯ, вёска ў Лятчанскім с/с Віцебскага р-на. Засн. ў 1963. Цэнтр калгаса імя Кірава. За 2 *км* на З ад Віцебска, на аўтамаб. дарозе Віцебск — Полацк. 176 ж., двароў 50 (1971). Механічная майстэрня. Дом культуры, 2 бібліятэкі, фельчарска-акушэрскі пункт, сталовая, магазін.

КІРАЎСКАЯ ВОБЛАСЦЬ, у складзе РСФСР. Утворана 7.12.1934 як край, з 5.12.1936 вобласць. Размешчана на У Еўрап. часткі СССР. Пл. 120,8 тыс. *км*². Нас. 1708 тыс. чал. (1971). Падзяляецца на 39 раёнаў; 19 гарадоў, 50 гар. пасёлкаў. Цэнтр г. Кіраў.

Паверхня — уваліста-хвалістая раўніна, нахіленая з Пн на Пд. На Пн Паўн. Увалы выш. да 214 *м*. У сярэдняй ч. Вяцкі Увал выш. да 284 *м*, парэзаны рачнымі далінамі і ярамі. На ПнУ Верхнекамскае ўзв. выш. да 337 *м*. Карысныя выкапні: жал. руда, гаручыя сланцы, фасфарыты, торф, буд. матэрыялы. Мінер. крыніцы. Клімат кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. —14; —16, ліп. 17—19 °С. Ападкаў 400—450 *мм* на Пд, 550—600 *мм* на Пн. Вегет. перыяд 155—170 дзён. Гал. р. Вятка з прытокамі: Кобра, Летка, Вялікая, Піжма (правыя); Чапца, Быстрыца, Кільмезь (левыя). На ПнУ вярхоўі Камы, на З — Вятлугі. Глебы на Пн падзолістыя, у цэнтр. ч. і на ПдЗ дзярнова-падзолістыя, дзярнова-карбанатныя і шэрыя лясныя, па далінах рэк алювіяльныя. На плоскіх водападзелах, на нізінах і забалочаных участках балотныя глебы. Пад лесам 53% тэр. Насяляюць вобласць рускія, жывуць таксама марыйцы, татары, удмурты, комі і інш. Сярэдняя шчыльн. 14,1 чал. на 1 км². Гарадскога нас. 56%. Найб. гарады: Кіраў, Кірава-Чапецк, Слабадской, Вяцкія Паляны, Кацельніч.

Асн. галіны прамысловасці: лясная, дрэваапрацоўчая, машынабуд., металаапр., хім., лёгкая, харч., буд. м. Лесанарыхтоўкі на ПнЗ і ПнУ. Асн. цэнтры дрэваапрацоўкі і лесахіміі Кіраў, Слабадской, Савецк, Мурашы, Кірава-Чапецк, Нававяцк, Кацельніч, Луза. Домабуд.-мэблевы, фанерна-запалкавы камбінаты, плюлозны з-д у Кіраве, лыжны камбінат у Нававяцку, камбінат стандартнага домабудавання ў Вяцкіх Палянах, папяровая ф-ка ў Лальску. Машынабудаванне і металаапрацоўка ў Кіраве (з-ды машынабуд., станкабуд., фіз. прылад, «Чырвоны інструментальшчык»), Вяцкіх Палянах (машынабуд. з-д), Амутнінску і Кацельнічы. Вытворчасць падымальных кранаў, дрэваапр. станкоў, мотаролераў, пральных машын і інш. Чорная металургія ў Амутнінску. Хім. прамысловасць (вытворчасць шын, аўтамаб. камер, фасфарытнай мукі ў Кіраве). Энерг. база гаспадаркі — мясцовы торф. Лёгкая прамысловасць (футравая ф-ка ў Слабадскім, камбінаты гарбарна-абутковы, гарбарна-футравы, штучнай скуры ў Кіраве, трыкатажны ў Кірава-Чапецку). Ф-кі муз. інструментаў і цацак у Кіраве. С. гасп. спецыялізуецца на вырошчванні збожжавых і на мяса-малочнай жывёлагадоўлі. На 1.1.1971 у вобласці 313 калгасаў і 227 саўгасаў. Пасяўная пл. (тыс. *га*, 1970) 1970,9, у т. л. пад збожжавымі 1229,1, кармавымі 613,8, бульбай і агароднінай 97,4, тэхн. 30,6. Асн. збожжавыя (тыс. *га*): жыта 678,5, авёс 285,5, пшаніца 109,6, ячмень 93,4. Сеюць грэчку, лён-даўгунец. На пач. 1971 (тыс. галоў) буйн. раг. жывёлы 853,2 (у т. л. кароў 386,0), свіней 347,2, авечак і коз 441,3. Даўж. чыгунак 1049 *км*. Асн. магістралі: Масква — Свярдлоўск, Кіраў — Котлас, Горкі — Кацельніч. Шашэйных дарог 21,2 тыс. *км*, у т. л. з цвёрдым пакрыццём 5,7 тыс. *км*. Суднаходства па Вятцы. Політэхн., с.-г. і пед. ін-ты, 29 сярэдніх спец. навуч. устаноў. 3 тэатры, 8 музеяў. Абл. газ. «Кировская правда».



Раён займае Пд *Цэнтральнабярэзінскай раўніны*. Карысныя выкапні: 2 радовішчы пясчана-жвіровага матэрыялу з агульнымі запасамі 5,1 млн. *м*³, у т. л. радовішча Казулічы — 3,9 млн. *м*³; 3 радовішчы цагельнай сыравіны — 0,44 млн. *м*³, у т. л. радовішча Любонічы — 0,2 млн. *м*³; радовішча мелу Сугроб (каля в. Кострыцкая Слабодка) — 0,17 млн. *т*; радовішча буд. пяску Каладзіно — 1,8 млн. *м*³. Сярэдняя т-ра студз. —0,7,



ліп. 18,2 °С. Ападкаў 586 *мм* за год. Вегет. перыяд 193 дні. Асн. рэкі: Ольса (прыток Бярэзіны), Белая, Дабасна (Добасна), Ала (прытокі Друці); на ПдЗ на мяжы К. р. з Бабруйскім цячэ Бярэзіна, на ПнУ на мяжы з Быхаўскім р-нам — Друць. Рэкі выкарыст. як водапрыёмнікі пры асушэнні балотаў і забалочаных зямель. На р. Друць Чыгірынскае вадасх. з ГЭС. Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (51,1%), дзярнова-падзолістыя забалачальныя (28,6%), дзярнова-балотныя (6,7%), тарфяна-балотныя (5,1%), алювіяльныя (8,5%). З мінер. глебаў 54,1% суглінкавых, 39,2 супясчаных, 6,7% пясчаных. Якасная ацэнка глебаў у балах: ворных зямель 50 (цана бала 0,25 *ц/га* збожжа), кармавых угоддзяў 41, усіх с.-г. угоддзяў 47. Пад лесам каля 40% тэр. Асн. лясныя абшары на Пн, пераважаюць хваёвыя і хваёва-шыракалістыя, з лісцевых бяроза, асіна, вольха, дуб, клён і інш. Насяляюць раён беларусы, ёсць рускія, украінцы і інш. Сярэдняя шчыльн. 28,7 чал. на 1 *км*². Гарадскога нас. 12,6%.

Прамысловасць апрацоўчая, развіваецца на мясцовай сыравіне. Найбольшыя прадпрыемствы ў Кіраўску: ільнозавод, філіял Бабруйскага малочнага з-да, камбінаты прамысловы, буд. матэрыялаў і быт. абслугоўвання, агароднінасушыльны з-д, раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі, спецыялізаванае аддз. Сельгастэхнікі. Жыліцкі вінаробны з-д. У раёне 15 калгасаў, 3 саўгасы і саўгас-тэхнікум (1971).

Калгасы і іх цэнтры: імя М. Горкага *(Дабрыца)*, імя Дзяржынскага *(Лёўкавічы)*, імя Ільіча *(Шалаёўка)*, імя Калініна (Барчыцы), «Камуніст» *(Добасна)*, імя Кірава *(Стаўпішчы)*, імя Куйбышава *(Барсукі)*, «Праўда» *(Чыгірынка)*, «Радзіма» *(Любонічы)*, *«Рассвет»* імя К. П. Арлоўскага



Гандлёвы комплекс у вёсцы Любонічы.

(Мышкавічы), імя Свярдлова *(Стайкі)*, імя Суворава *(Падсёлы)*, «III з'езд Саветаў» *(Пацава Слабада)*, імя Чапаева *(Гарадзец)*, «Чырвоны баец» *(Паўлавічы)*. Саўгасы і іх цэнтры: «Бераснёўскі» *(Капланаўка)*, імя Кірава *(Скрыпліца)*, «50 гадоў БССР» *(Хвайніца)*. Жыліцкі саўгас-тэхнікум *(Жылічы)*.

С. гасп. спецыялізуецца на вытворчасці мяса, малака, бульбы, лёну і збожжа. Пад с.-г. ўгоддзямі каля 50% тэр. Асушана (1970) 10 тыс. *га* забалочаных зямель. Агульная пасяўная пл. (тыс. *га*, 1970) 44,9, з іх пад збожжавымі і зернебабовымі (жыта, ячмень, лубін на зерне, авёс, пшаніца) 20,3, тэхн. (лён) 1,9, бульбай 8,2, кармавымі культурамі 14,1. На пач. 1971 было (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 37,6, у т. л. кароў 17,3; свіней 30,4, авечак і коз 2,1. Па тэр. раёна праходзіць шаша Магілёў — Бабруйск з адгалінаваннямі. На пач. 1971 у раёне 10 сярэдніх, 15 васьмігадовых, 33 пач. школы, школа рабочай і сельскай моладзі, муз. і спарт. школы, 8 дашкольных устаноў, 43 клубныя ўстановы, 36 масавых б-к, 34 кінаўстаноўкі (у т. л. 24 стацыянарныя), 4 бальніцы, 20 фельч.-ак.

Сартаванне яблык на прыёмным пункце калгаса «Рассвет».



пунктаў, 3 радзільныя дамы. У 1970 у раёне працавала 412 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, у т. л. 23 інжынеры, 62 аграномы, заатэхнікі, вет. ўрачы, лесаводы, 36 урачоў, 14 эканамістаў, 289 настаўнікаў і інш.; 601 чал. з сярэдняй спец. адукацыяй. Раённая газ. «Кіравец». *В. І. Ярцаў.* Мінск.

КІРГІЗІЯ, гл. *Кіргізская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка.*

КІРГІЗСКАЯ МОВА, мова *кіргізаў*, асноўнага насельніцтва Кіргізскай ССР. Належыць да кіргізска-кыпчацкай групы *цюркскіх моў*. У СССР на К. м. гаворыць каля 1,4 млн. чал. Літ. мова створана ў сав. час; пісьменнасць з 1928 на аснове лац., з 1940 рус. графікі.

Вылучаюць тры дыялекты К. м.: паўн., паўд.-ўсх. і паўд.-зах. Асаблівасці К. м.: наяўнасць другасных даўжынь (тоо «гара» з та), болей паслядоўная, чым у інш. цюркскіх мовах, губная гармонія; пачатковае «дж» (напр., кірг. джол «шлях» адпавядае турэц., туркм. йол, каз. энол, алт. дзьол).

Літ.: Батманов И. А. Современный киргизский язык, в. 1, 4 изд., Фрунзе, 1963; Юдахин К. К. (сост.). Киргизско-русский словарь, М., 1965; Языки народов СССР, т. 2, М., 1966.

КІРГІЗСКАЯ САВЕ́ЦКАЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ РЭСПУБЛІКА (Кыргыз Савеццік Сацыялісцік Рэспублікасы), Кіргізія, утворана 5.12.1936. Размешчана на ПнУ Сярэдняй Азіі, на ПдУ мяжуе з Кітаем. Пл. 198,5 тыс. *км*². Нас. 3003 тыс. чал. (1971). Сталіца г. Фрунзе. Падзяляецца на 3 вобласці (Ісык-Кульская, Нарынская, Ошская), 8 раёнаў цэнтр. падпарадкавання, 15 гарадоў, 35 гар. пасёлкаў. [На ўклейках: фіз. карта, іл. да раздзелаў Прырода (I), Нар. гасп. (I), Архітэктура, Выяўл. маст. (II)].

Дзяржаўны лад. Кірг. ССР — саюзная савецкая сацыяліст. рэспубліка. Уваходзіць у СССР

Пік Перамогі ў Цэнтральным Цянь-Шані.





Возера Ісык-Куль каля горада Рыбачае.

на аснове добраахвотнасці і раўнапраўя. Канстытуцыя прынята V Надзвычайным з'ездам Саветаў Кірг. ССР 23.3.1937. Уся ўлада ў рэспубліцы належыць працоўным горада і вёскі ў асобе Саветаў дэпутатаў працоўных. Вышэйшыя органы дзярж. улады — Вярх. Савет, які выбіраецца на 4 гады, а ў перыяд паміж сесіямі — Прэзідыум Вярх. Савета. Вышэйшы выканаўча-распарадчы орган — Савет Міністраў. Мясцовыя органы дзярж. улады — абласныя, раённыя, гарадскія, пасялковыя, сельскія і аільныя Саветы дэпутатаў працоўных. Суд. сістэма: Вярх. суд Кірг. ССР, абл. суды, раённыя (гарадскія) нар. суды. Кірг. ССР мае свой дзярж. герб, флаг і гімн.

Прырода. К. — горная краіна; у яе межах зах. частка адной з найвыш. сістэм Азіі — Цянь-Шаня. Горныя хрыбты выш. больш за 4000 *м* чаргуюцца з глыбокімі далінамі і цяснінамі. Найб. хрыбты: на Пн — Кіргізскі, Таласкі Алатау, Кунгей-Алатау, Чаткальскі; у цэнтры — Ферганскі, Тэрскей-Алатау; на Пд — Туркестанскі, Алайскі, Заалайскі, Какшалтау. На У горны вузел з вяршынямі пік Перамогі 7439 *м* і пік Хан-Тэнгры 6995 *м* (на граніцы з Каз. ССР). Ёсць ледавікі на Хан-Тэнгры і Акшыйрак у Цэнтр. Цянь-Шані. Найб. ледавікі — Паўд. Інышьчэк (даўж. 59,5 *км*) і Паўн. Інышьчэк (38,2 *км*). Паміж хрыбтамі Кунгей-Алатау і Тэрскей-Алатау катлавіна воз. Ісык-Куль. На З Кіргізіі паміж горных хрыбтоў катлавіны і пласкагор'і — сырты, якія выкарыстоўваюцца як летняя паша. Найб. даліны: Чуйская, Талаская, Качкорская, Сусамырская, Нарынская, частка Ферганскай. Карысныя выкапні: вугаль (1-е месца ў Сярэдняй Азіі па запасах, радовішчы Алмалык, Кызыл-Кія, Кок-Янгак, Таш-Кумыр, Джэргалан), ртуць (Хайдаркен), сурма (Кадамджайскае і Тэрэк-Сайскае радовішчы), нафта (Кок-Таш, Чангыр-Таш), поліметалічныя руды, серны калчадан, мыш'як, буд. матэрыялы. Клімат рэзка кантынентальны. Значная працягласць тэр. і парэзанасць рэльефу абумоўліваюць фарміраванне розных тыпаў клімату — ад паўпустыннага (міжгорныя даліны Паўн. і Зах. Цянь-Шаня і Ферганская даліна) да халодных высакагорных тундраў (Цэнтр. Цянь-Шань). Зіма ўмерана халодная. Сярэдняя т-ра студз. ад −1,5 (Джалал-Абад) да −27,7 °С (Аксайская даліна). Лета ў далінах гарачае, у гарах халаднаватае. Сярэдняя т-ра ліп. ад 26,9 (Ленін-Джол) да 3,9 °С (абсерваторыя «Цянь-Шань»). Ападкаў у зах. Прыісыккуллі 110 *мм* (Рыбачае), на зах. схілах Ферганскага хр. 900 *мм*, у Чуйскай і Таласкай далінах 300—400 *мм*, у Унутр. і Цэнтр. Цянь-Шані 200—300 *мм* за год. Рэкі горныя, снегавога і ледавіковага жыўлення, багатыя на гідраэнергію, выкарыстоўваюцца на арашэнне. Найб. Нарын, Чу, Талас, Карадар'я, Кызылсу, Сарыджаз і інш. Азёры Ісык-Куль (салёнае), Санкёль (прэснае), Чатыркёль (саленаватае). Глебы ў міжгорных далінах і перадгор'ях шэразёмныя, вышэй за 1200—1300 *м* каштанавыя і чарназёмападобныя; на больш увільготненых паўн. схілах да 2000—2800 *м* лясныя бурыя. Вышэй за 2800—3000 *м* высакагорныя лугавыя глебы. У перадгор'ях палыновыя, палынова-злакавыя і злакавыя стэпы, вышэй у гарах разнатраўна-злакавыя лугі з хмызнякамі. Вышэй зоны лугоў пачынаецца зона лясоў з грэцкага арэха, клёна, елкі, піхты, вышэй — высакагорныя лугі і лугастэпы. У далінах і катлавінах



Здабыча вугалю ў радовішчы Алмалык.

Унутр. Цянь-Шаня камяністыя пустыні, паўпустыні і сухія стэпы. Горныя стэпы, высакагорныя лугі і лугастэпы выкарыстоўваюцца як летняя паша, даліны і сырты Цэнтр. Цянь-Шаня — як зімовая паша. Багаты і разнастайны жывёльны свет. У К. каля 80 відаў млекакормячых, 336 відаў птушак, 35 відаў земнаводных і паўзуноў, больш за 30 відаў рыб. Ісык-Кульскі і Сарычэлекскі запаведнікі.

Насельніцтва. Кіргізы (43,8%), рускія (29,2%), узбекі (11,3%), украінцы (4,1%), татары (2,4%) і інш. Сярэдняя шчыльн. 15,1 чал. на 1 *км*². Найб. густа заселены даліны і міжгорныя катлавіны. Гарадскога нас. 38%. Найб. гарады: Фрунзе (442 тыс. ж., 1971), Ош, Джалал-Абад, Пржавальск, Такмак, Кызыл-Кія, Нарын.

Гістарычны нарыс. Тэр. К. заселена з эпохі палеаліту. Пастухова-земляробчыя заняткі насельніцтва да 7—6 ст. да н. э. заменены качавой жывёлагадоўляй і аселым земляробствам. У 7—4 ст. да н. э. на Пн К. качаваў саюз плямёнаў сярэднеазіяцкіх скіфаў — сакі, якіх у 3 ст. да н. э.— 5 ст. н. э. змянілі усуні. Паўд. К. ўваходзіла ў рабаўладальніцкія дзяржавы Давань (2—1 ст. да н. э.), Кушанскае царства (1 ст. да н. э.— 4 ст. н. э.). У 6—7 ст. тэр. К. ўваходзіла ў Цюркскі, у пач. 8 ст. ў Цюргешскі, з сярэдзіны 8 ст. ў Карлукскі каганаты. Першыя звесткі пра кіргізаў на Цянь-Шані адносяцца да 10 ст. У 10—12 ст. у іх складваюцца феад. адносіны, абвастраецца класавая барацьба свабодных качэўнікаў супраць феадалаў, растуць гарады, развіваюцца гандаль, рамёствы, культура. У выніку нашэсця манголаў у пач. 13 ст. разбураны гарады і аселаземляробчыя паселішчы. У 14—15 ст. у складзе дзяржавы Магалістан пачала складвацца кірг. народнасць, гэты працэс закончыўся ў 18 ст. У 2-й пал. 17—18 ст. кіргізы адбівалі ўварванне айратаў (калмыкаў), пазней і кіт.-маньчжурскіх заваёўнікаў. У пач. 19 ст. К. пад уладай *Какандскага ханства*, панаванне якога — адна з самых змрочных старонак гісторыі кіргізаў. Збліжэнне кіргізаў з Расіяй пачалося ў канцы 18 ст. ўстанаўленнем пасольскіх сувязей. У 50—60-я г. 19 ст. паўн.-кірг. плямёны прынялі расійскае падданства. Пасля ліквідацыі Какандскага ханства (1876) да Расіі далучыліся і паўд. кіргізы. Добраахвотнае ўз'яднанне К. з Расіяй мела прагрэс. значэнне для сац.-эканам. і культ. развіцця кірг. народа, пазбавіла яго ад ярма какандскіх феадалаў, выратавала ад заняволення інш. адсталымі дзяржавамі Усходу і англ. імперыялістамі. Пад уздзеяннем рас. эканомікі ў канцы 19 — пач. 20 ст. пачаўся працэс распаду патрыярхальна-феадальных і складванне капіталіст. адносін. Гэтаму садзейнічала і перасяленне ў К. сялян з Цэнтр. Расіі, Украіны і Беларусі. Пачалося навук. вывучэнне краю і яго насельніцтва (П. П. Сямёнаў-Цян-Шанскі, М. М. Пржавальскі, А. П. Федчанка, І. В. Мушкетаў, В. У. Бартальд). Пад уплывам рэвалюц. руху ў Расіі працоўныя К. падымаліся на барацьбу за сац. і нац. вызваленне. У рэв. 1905—07 адбыліся першыя забастоўкі шахцёраў, рэвалюц. выступленні сялян-перасяленцаў і кірг. дэхкан. Першыя с.-д. гурткі і групы ўзніклі ў 1905—07. У 1-ю сусв. вайну павялічыліся падаткі і паборы, у сялян адбіралі зямлю ў каланізацыйны фонд. У 1916 нар. абурэнне вылілася ў антыімперыял. нац.-вызв. паўстанне. У выніку Лют. рэв. ў сак.— крас. 1917 у К. ўзніклі Саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў, устанавілася двоеўладдзе. Першыя Сав. ўладу ўстанавілі шахцёры Кызыл-Кія і Сулюкты. Да сярэдзіны 1918 Сав. ўлада перамагла ва ўсёй Кіргізіі. Эканам. і паліт. мерапрыемствы Сав. улады сустрэлі лютае супраціўленне скінутых эксплуататарскіх класаў. Баі, манапы і мулы стварылі басмацкія атрады і разам з белаказакамі развязалі грамадз. вайну. Чырв. Армія і добраахвотніцкія атрады працоўных К. ў 1918—23 разграмілі контррэвалюц. мяцяжы і разбілі басмачоў. Важнае значэнне для аднаўлення і развіцця эканомікі К. мелі зямельна-водныя рэформы на Пн (1921—22) і на Пд К. (1927—28), паводле якіх адабраны землі ў перасяленцаў-кулакоў і перададзены батракам і беднаце.

У выніку нац.-дзярж. размежавання народаў Сярэдняй Азіі ў 1924 створана Кара-Кіргізская аўт. вобласць у складзе РСФСР. У 1925 яна перайменавана ў Кірг. аўт. вобласць, у 1926 пераўтворана ў Кірг. АССР, 5.12.1936 у Кірг. ССР. З братняй дапамогай народаў СССР у перадваенныя гады К. ліквідавала эканам. і культ. адсталасць і, мінаючы капіталіст. стадыю, перайшла да сацыялізма. Да 1940 у К. пабудавана 140 прамысл. прадпрыемстваў і эл. станцый, створаны нац. кадры рабочага класа і інтэлігенцыі, калектывізавана 98,9% сельскага насельніцтва, качавыя гасп. пераведзены на аселасць. У Айч. вайну воіны К. гераічна змагаліся з ням.-фаш. захопнікамі. У баях пад Масквой праславілася 8-я гвардз. стралк. дывізія пад камандаваннем І. Ф. Панфілава, сфарміраваная з салдатаў Кірг. і Каз. ССР. 40 тыс. воінаў К. ўзнаг. ордэнамі і медалямі, 70 чал. прысвоена званне Героя Сав. Саюза, у т. л. Дж. *Асаналіеву*, які вызначыўся пры фарсіраванні Зах. Дзвіны на Беларусі. У К. працавалі многія прамысл. прадпрыемствы, эвакуіраваныя з зах. абласцей СССР. У 1969 аб'ём прамысл. вытворчасці павялічыўся ў параўнанні з 1913 у 164 разы, а прадукцыя с. гасп. больш чым у 5 разоў. К. ўзнаг. 2 ордэнамі Леніна (1957, 1963).

Камуністычная партыя, камсамол, прафсаюзы. Першыя бальшавіцкія арг-цыі ў К. ўзніклі ў Сулюкце (ліст. 1917), Кызыл-Кіі (люты 1918) і Ошы (сак. 1918). 2.4.1918 у Пішпеку (Фрунзе) адбыўся 1-ы агульнагарадскі сход чл. РКП(б). Парт. арг-цыі ўзначалілі барацьбу працоўных за ўмацаванне Сав. улады. У чэрв. 1918 створана КП Туркестана, у якую ўвайшлі бальшавіцкія арг-цыі К. У гады грамадз. вайны бальшавікі К. кіравалі барацьбой працоўных супраць аненкаўска-дутаўскіх бандаў, кулацка-эсэраўскіх мяцяжоў, басмачоў і бурж. нацыяналістаў. З утварэннем Кара-Кіргізскай аўт. вобл. ў сак. 1925 адбылася 1-я абл. канферэнцыя камуністаў Кара-Кіргізіі. 23.4.1937 рашэннем ЦК ВКП(б) Кірг. абком ВКП(б) пераўтвораны ў ЦК КП Кіргізіі. У Айч. вайну КП(б) Кіргізіі мабілізавала працоўных К. на дапамогу фронту; пасля вайны ўзначальвае барацьбу працоўных К. за далейшае развіццё нар. гасп. і культуры



1



2



3



4



5



Кіргізская ССР І.

1. Горы Тэрскей-Алатау на ўсходзе Кіргізіі.
2. Атара авечак калгаса «Ульгу» Джэтыагузскага раёна Ісык-Кульскай вобласці.
3. Фрунзе. Дом урада.
4. Прадукцыя Фрунзенскага завода сельскагаспадарчага машынабудавання.
5. Кіргізскі камвольна-суконны камбінат у Фрунзе.
6. Нарыхтоўчы пункт Джалал-Абадскага бавоўнаперапрацоўчага завода. Ошская вобласць.



1



2



3

рэспублікі. На 1.1.1971 у КП Кіргізіі 3470 пярвічных арг-цый, якія аб'ядноўваюць 104 тыс. камуністаў.

Першыя камсамольскія арг-цыі на тэр. К. ўзніклі ў 1918—19. Устаноўчы з'езд камсамола (1925) арганізацыйна афарміў і аб'яднаў камсамольскія арг-цыі К. У 1937 адбыўся 1-ы з'езд ЛКСМК. Камсамол К. актыўна ўдзельнічаў у індустрыялізацыі, калектывізацыі с. гасп. У Айч. вайну на фронце было больш за 80 тыс. камсамольцаў, 21 з іх прысвоена званне Героя Сав. Саюза. На 1.1.1971 у ЛКСМК было каля 260 тыс. членаў.

Прафсаюзы ў К. ўзніклі пасля Люг. рэвалюцыі. У 1925 адбыўся ўстаноўчы з'езд, які выбраў Кірг. абласны савет прафсаюзаў. На 1.1.1971 у К. 5692 фабрычна-заводскія і мясцовыя к-ты, якія аб'ядноўваюць 803 тыс. чал. Маюць 259 палацаў культуры і клубаў, 154 бібліятэкі, санаторыі, дамы адпачынку.

Народная гаспадарка. За гады Сав. улады К. стала рэспублікай з усебакова развітай эканомікай. Гал. галіны гаспадаркі: вугальная прамысловасць, вытворчасць буд. матэрыялаў, машынабудаванне, жывёлагадоўля, паліўное земляробства, лёгкая і харч. прамысловасць. У К. вылучаюцца 2 буйныя індустр. раёны — Паўн. Кіргізія і Паўд.-Зах. Кіргізія. Паўн. К. дае $^2/_3$ прамысл. прадукцыі, найб. развіты машынабудаванне, металаапрацоўка, вытворчасць эл. энергіі і буд. матэрыялаў, лёгкая (пераважна трыкатажная, швейная і абутковая) і харч. прамысловасць. Паўд.-Зах. К. дае $^1/_3$ прамысл. прадукцыі, найб. развіты каляровая металургія, горнарудная, паліўная і тэкстыльная (пераважна баваўняная і шаўковая) прамысловасць. У 1970 здабыта 3,7 млн. *т* вугалю і 297,9 тыс. *т* нафты. Па вытворчасці ртуці і сурмы К. належыць 1-е месца ў СССР. У Чуйскай даліне і Сумсары здабыча і абагачэнне свінцовых рудаў. Па запасах гідраэнергіі (15,2 млн. *квт*) К. на 3-м месцы ў СССР. Найб. ГЭС Аламедзінскія (6 станцый), Учкурганская; Фрунзенская ЦЭЦ. Будуюцца (1972) Тактагульскі гідравузел (магутн. ГЭС 1,2 млн. *квт*, аб'ём вадасх. 19,3 млрд. $м^3$) і Ат-Башынская ГЭС. У 1970 выпрацавана 3,56 млрд. *квт·гадз* эл. энергіі. Машынабудаванне і металаапрацоўка (з-д с.-г. машын імя Фрунзе, «Фрунземаш», фізічных прылад, аўтазборачны ў Фрунзе, электралямпавы ў Майлі-Саі, электрамеханічны ў Ошы і інш.). Вытворчасць буд. матэрыялаў (з-д сілікатных вырабаў у Іванаўцы, з-д зборных жалезабетонных канструкцый і дэталяў у Ошы, цэментны ў Фрунзе). Дрэваапрацоўка і мэблевая прамысловасць у Фрунзе. З лёгкай прамысловасці найб. развіта тэкстыльная. У Ошскай вобл. 5 баваўнаачышчальных з-даў, у Ошы шаўковы і баваўняны камбінаты. Першапачатковая апрацоўка ба-



4

Кіргізская ССР II.

1. Маўзалей Манаса. 14 ст.
2. П. П. Іваноў. Будынак гарвыканкома на Савецкай пл. ў г. Фрунзе. 1956.
3. Ю. В. Біліцкі і А. Д. Бачароў. Адзін з будынкаў АН Кіргізскай ССР. Пач. 60-х г. 20 ст.
4. Г. Айтыеў. Поўдзень на Ісык-Кулі. 1954. Траццякоўская галерэя. Масква.
5. М. Амаркулаў. Дэлегатка 6-га Сусв. фестывалю моладзі і студэнтаў у Маскве. 1957. Кірг. музей выяўл. мастацтваў. Фрунзе.
6. С. А. Чуйкоў. Раніца. 1947. Траццякоўская галерэя. Масква.
7. В. М. Мануілава. Партрэт Тагалока Малдо. 1940—41. Кірг. музей выяўл. мастацтваў. Фрунзе.



5



6



7





На Ошскім шаўковым камбінаце.

воўны ў Араване, Джалал-Абадзе, Тактагуле, Кара-Су. У Фрунзе гарбарныя з-ды, абутковыя, трыкат., баваўняна-суконны і тэкстыльны камбінаты; швейная ф-ка; у Кызыл-Кіі абутковая ф-ка, у Такмаку ф-ка першанапачатковай апрацоўкі воўны. У харч. прамысловасці найб. развіта мясная (мясакамбінаты ў Фрунзе, Ошы, Рыбачым), цукровая (6 з-даў у Чуйскай даліне) і масласыраробная (з-ды ў Кіраўскім і Узгене). У Кара-Су алейнаэкстракцыйны з-д, у Фрунзе млынкамбінат, хлебакамбінат, кандытарская і тытунёвая ф-кі, з-д шампанскіх вінаў, у Джалал-Абадзе і Такмаку кансервавыя з-ды. Паводле рашэнняў XXIV з'езду КПСС за гады 9-й пяцігодкі аб'ём вытворчасці прамысл. прадукцыі павялічыцца на 45—48%. Будзе развівацца электраэнергетыка, машынабудаванне, каляровая металургія, лёгкая прамысловасць. Павялічыцца вытворчасць с.-г. машын у 1,7 раза, тканін — у 2,9—3,3, верхніх трыкатажных вырабаў — у 1,7 і прадова-агародніннага кансерваў — у 1,8 раза. Завершыцца буд-ва Тактагульскай ГЭС, пачнецца буд-ва Куржайскай ГЭС. Будзе пабудаваны з-д электронна-вылічальных машын, другая чарга баваўнянага камбіната ў г. Ош, камвольна-прадзільная ф-ка, мясакамбінат у Такмаку, рэканструяваны з-д с.-г. машынабудавання.

Гал. галіна сельскай гасп.— жывёлагадоўля. У далінах пераважае земляробства. На 1.1.1971 у К. 245 калгасаў і 103 саўгасы. Больш за 60% пасяўной пл. арашаецца. Найб. арашальныя сістэмы і каналы: Вялікі Чуйскі канал і Краснарэчанская сістэма ў Чуйскай даліне, Камсамольскі канал у Ісык-Кульскай катлавіне і інш. Пасяўная пл. (тыс. *га*, 1970) 1264,2, з іх пад збожжавымі і зернебабовымі 553,5, тэхн. 148,8, бульбай 26,1, агароднінай 12,4, кармавымі 489,8. Асн. збожжавыя культуры (тыс. *га*): пшаніца — 325,4 і ячмень — 202,3, сеюць кукурузу, авёс, жыта, рыс. З тэхн. (тыс. *га*): бавоўнік — 74,8, цукр. буракі — 51,1, сеюць тытунь, лекавы мак, эфіраалейныя культуры. Бавоўнік сеюць пераважна на Пд, цукр. буракі ў Чуйскай даліне, тытунь у Наўкацкім, Джангыджольскім, Узгенскім р-нах і ў Таласкай даліне. Садоўніцтва, вінаградарства і субтрапічнае пладаводства (персікі, гранат, хурма). У жывёлагадоўлі пераважае танкарунная і паўтанкарунная авечкагадоўля. На 1.1.1971 (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 912 (у т. л. кароў 380), авечак і коз 9455, свіней 244. Танкарунная авечкагадоўля, малочная жывёлагадоўля, свінагадоўля ў Чуйскай даліне і ў Ісык-Кульскай катлавіне, конегадоўля ў Цэнтр. Цянь-Шані. Шаўкаводства (пераважна ў Паўд. К.), рыбалоўства (на воз. Ісык-Куль), лесапладовая гаспадарка (арэхавыя пладовыя лясы ў Ошскай вобл.). У гарах паляўнічы промысел. За гады 9-й пяцігодкі вытворчасць воўны дасягне 30 тыс. *т*. Павялічыцца вытворчасць мяса, малака, тытуню, садавіны, агародніны. Будуць уведзены ў эксплуатацыю 30 тыс. *га* арашальных зямель, 2 вял. вадасховішчы, рэканструяваны арашальныя сістэмы на пл. 90 тыс. *га*, абводнена 400 тыс. *га* пашы, палепшана водазабяспечанасць пашы. Асн. від транспарту — аўтамабільны. Даўж. шашэйных дарог 19,5 тыс. *км*, у т. л. з цвёрдым пакрыццём 11,4 тыс. *км* (1970). Асн. магістралі: Фрунзе — Нарын — перавал Таругарт, Фрунзе — Алма-Ата, кальцавая дарога вакол воз.

Будаўніцтва Тактагульскай ГЭС на р. Нарын.





Уборка цукровых буракоў у калгасе імя Леніна Кантскага раёна.

Ісык-Куль, Ош — Харог (Памірскі тракт) і інш. Чыгунак 371 *км*. Асн. чыгунка Рыбачае — Фрунзе — Лугавой. Ад Ферганскай кальцавой чыгункі адгалінаванні на Ош, Кызыл-Кію, Кок-Янгак, Таш-Кумыр. Па воз. Ісык-Куль суднаходства. Авіятранспарт.

Ахова здароўя. У 1913 на тэр. Кірг. ССР было 6 бальніц на 100 ложкаў (1,2 на 10 тыс. ж.), 30 амбулаторый, 21 урач. У 1940 працавалі 112 бальнічных устаноў на 3,8 тыс. ложкаў (24,1 на 10 тыс. ж.), 600 урачоў (3,8 на 10 тыс. ж.), 2,6 тыс. чал. сярэдняга мед. персаналу (16,1 на 10 тыс. ж.). На пач. 1970 — 271 бальніца на 30,3 тыс. ложкаў (103,2 на 10 тыс. ж.), 6,1 тыс. урачоў (20,8 на 10 тыс. ж.), 20 тыс. чал. сярэдняга мед. персаналу (68,2 на 10 тыс. ж.). 5 НДІ. Курорты: Джалал-Абад, Джэты-Агуз, Ісык-Ата, узбярожжа в. Ісык-Куль; санаторый «Бланітны Ісык-Куль» і інш.

Народная асвета. У 1914 у К. было 107 школ (больш за 7 тыс. вучняў), 1 гімназія, 3 прагімназіі. Пісьменных сярод кірг. насельніцтва было 0,6% (1916). За гады Сав. улады ў К. ліквідавана непісьменнасць, ажыццёўлена ўсеагульнае абавязковае навучанне на роднай мове, створана сістэма вышэйшай і сярэдняй спец. адукацыі. У 1970 працавала 849 дашкольных дзіцячых устаноў (90,7 тыс. дзяцей). У 1970/71 навуч. г. 1854 агульнаадук. школы ўсіх тыпаў (772,4 тыс. вучняў), 36 сярэдніх спец. навуч. устаноў (41,7 тыс.). 9 ВНУ (45,4 тыс. студэнтаў): *Кіргізскі універсітэт*, політэхн., с.-г., мед., 2 пед., жаночы пед. ін-т, ін-т мастацтва, ін-т фіз. культуры. У К. (1970) 1351 масавая б-ка (11 383 тыс. экз.), 6 музеяў, 1030 клубных устаноў, 1089 кінаўстановак.

Навуковыя ўстановы. У 1971 у К. працавала *Акадэмія навук Кіргізскай ССР* в ін-тамі: аўтаматыкі, біяхіміі і фізіялогіі, біялогіі, неарган. і фіз. хіміі, арган. хіміі, фізікі і матэматыкі, фізікі і механікі горных парод, фізіялогіі і эксперым. паталогіі высакагор'я, геалогіі, эканомікі, філасофіі і права, гісторыі, мовы і л-ры і інш. Працуюць 64 навук. установы: НДІ — педагогікі, аховы маці-рынства і дзяцінства, жывёлагадоўлі і ветэрынарыі, земляробства, курарталогіі і фізіятэрапіі, анкалогіі і радыялогіі, эпідэміялогіі, мікрабіялогіі і гігіены, эканомікі і эканам. метадаў планавання, глебазнаўства, воднай гасп. і інш.

Друк, тэлебачанне, радыёвяшчанне. У 1971 у К. выдавалася 90 газет, у т. л. 8 респ.: «Советтик Кыргызстан» («Савецкая Кіргізія»), «Советская Киргизия», «Комсомолец Киргизии», на рус. мове, «Ленинчил жаш» («Ленінская моладзь»), «Кыргызстан пионери» («Піянер Кіргізіі»), «Мугалимдер газетасы» («Настаўніцкая газета»), «Шыйуади чи» («Сцяг Кастрычніка», на дунганскай мове). У К. ў 1970 выдавалася 45 часопісаў і інш. перыяд. выданняў, выпушчана 855 назваў кніг тыражом 5066 тыс. экз. Найб. выдавецтвы: «Мектеп», «Кыргызстан», «Ала-Тоо». У Фрунзе тэлецэнтр (з 1956), радыёвяшчанне на кірг. і рус. мовах.

Літаратура. Разнастайныя жанрам і формаю ўзоры кірг. фальклору: пастухоўскія і любоўна-лірычныя песні, кашок (галашэнні), эпічныя сказанні, казкі і інш. Эпас *«Манас»* праслаўляе мужнасць, воінскі гонар, любоў да Радзімы. Нар. творчасць і эпас папулярызавалі акыны і манасчы. Найб. вядомы манасчы С. Караласў. Пісьмовая л-ра К. нарадзілася пасля Кастр. рэвалюцыі. Яшчэ да рэвалюцыі выступілі акыны-дэмакраты *Тактагул Сатылганаў*, Тагалок Малдо, яны выкрывалі драпежнасць баяў і манапаў, а ў сав. час апявалі буд-ва новага жыцця. Іх прадаўжальнікі Б. Алыкулаў, К. Акыеў, А. Усенбаеў услаўлялі ідэі рэвалюцыі, заклікалі да самаадданай працы. У 1924 створана першая кірг. газ. «Эркін-Тоо» («Вольныя горы»), вакол якой аб'ядналіся пісьменнікі А. *Такамбаеў*, К. *Баялінаў*, М. Элебаеў, М. Такабаеў і інш. Паэма, драма, раман пачаўляюцца ў кірг. л-ры ў 30-я г. Асабліва плённа ў гэты час працавалі Такамбаеў, Т. *Сыдыкбекаў*, Дж. Баканбаеў, Дж. Турусбекаў, Элебаеў, А. Асмонаў, К. Джантошаў. Глыбокім сав. патрыятызмам прасякнуты зб. вершаў і паэм перыяду Айч. вайны Баканбаева, М. Элебаева, Такамбаева, Т. Уметаліева, К. Малікава. З 50-х г. адно з асн. месцаў у кірг. л-ры пачынае займаць проза: раманы «Сярод гор» Сыдыкбекава, «Фронт» У. Абдукаімава, «Шлях да шчасця» Ш. Бейшэналіева, «Братэрства» К. Баялінава і інш. У развіцці пасляваен. драматургіі вял. ролю адыгралі п'есы Т. Абдумамунава «Дачка Атабека», «Вузкая цясніна», драма Малікава «На высокай зямлі» і інш. Асабліва вылучаецца творчасць лаўрэата Ленінскай прэміі Ч. *Айтматава*. У пасляваен. перыяд раскрыўся самабытны талент С. Эраліева, Б. Сарыпагоева, М. Абдылкасымавай і інш. Развіваецца літ. крытыка (У. Джакішаў, К. Рахматулін, В. Керымжанава і інш.). На кірг. мове выдадзены зб. Я. Купалы «Вершы» (1954), З. Бядулі «Апавяданні» (1958), аповесць М. Лынькова «Міколка-паравоз» (1960), зб. вершаў і паэм П. Броўкі «А дні ідуць...» (1966). На бел. мову перакл. аповесці Айтматава «Джаміля» (1962), «Бывай, Гульсары!» (1971), Бейшэналіева «Кычан» (1964), у перыёдыцы друкаваліся пераклады паасобных твораў Абдумамунава, Айтматава, М. Буларкіевай, Малікава, Эраліева і інш.

Архітэктура. Раннія аселыя паселішчы, умацаваныя валамі і вежамі, з глінабітнымі і сырцовымі пабудовамі (гарадзішча Шурабашат) вядомы ў К. з 4—1 ст. да н. э. Да мангольскага завалявання культура качавога і аселага насельніцтва К. развівалася паралельна. У 5—10 ст. будуюцца гарады (Узген, Ош), крэпасці, замкі феадалаў, пачаўляюцца абнесеныя сценамі тэрыторыі для засцярогі ад нападу качэўнікаў. У мусульм. дзяржаве Караханідаў (10—12 ст.) ставяцца мячэці, мінарэты, маўзалеі (група з трох маўзалеяў у Узгене, 11—12 ст.). Ад 14 ст. вобрагся маўзалей Манаса. У выніку ман-





Ю. М. Градаў і А. І. Каржэмпо. Кафэ «Сон-Куль» у г. Фрунзе. Пач. 60-х г. 20 ст.

гольскага нашэсця гарады заняпалі. К. стала пераважна краінай качэўнікаў, асн. жыллё якіх — разборная юрта. Пасля ўз'яднання К. з Расіяй (60—70-я г. 19 ст.) развіваюцца гарады (Пішпек, Каракол — сучасныя Фрунзе і Пржавальск, і інш.) з прамавугольнай планіроўкай і аднапавярховай забудовай. У сав. час гарады і пасёлкі добраўпарадкоўваюцца, багата азеляняюцца (ген. план Фрунзе, 1948—58). Вядзецца курортнае (на воз. Ісык-Куль, 1960) і ірыгацыйнае буд-ва (Арто-Такойскае вадасх. з плацінаю, 1963).

Выяўленчае мастацтва. Ад эпохі неаліту і бронзы на тэр. К. асталіся наскальныя роспісы, ляпная кераміка з геам. узорам. Да 4—1 ст. да н. э. адносяцца ўпрыгожанні з золата і бронзы, роспісная кераміка, літыя з бронзы фігуркі жывёл, посуд. У будыйскіх храмах (5—10 ст.) ставяцца статуі багоў, робяцца барэльефы і роспісы (Ак-Бешым у Чуйскай даліне). У 10—12 ст. мячэці, маўзалеі аздабляюцца ўзорыстаю муроўкай з цэглы, разьбою па ганчы і тэракоце (геам. і раслінныя ўзоры, надпісы). Асн. віды дэкар.-прыкладнога мастацтва — кераміка, ткацтва дываноў (лямцавыя дываны «шырдакі»), вышыўка, ювелірная справа. Сярод матываў маляўнічага арнаменту пераважае ўзор «барановы рог». У сав. час развіваецца прафес. мастацтва. Адзін з заснавальнікаў нац. кірг. жывапісу — Г. *Айтыеў*. Станаўленню кірг. выяўл. мастацтва садзейнічалі рус. мастакі В. Абразцоў, С. Чуйкоў, А. Ігнацьеў, В. Мануілава, Л. Ільіна, А. Міхалёў. Сярод кірг. мастакоў 50—60-х г. жывапісцы М. Амаркулаў, А. Усубаліеў, А. Асмонаў, С. Акылбекаў, Дж. Кажахметаў, К. Керымбекаў, скульптары Т. Садыкаў, А. Мухутдзінаў, графікі А. Згібнеў, А. Асташаў, У. Рагачоў, Р. Нудэль. Значны твор манум.-дэкар. мастацтва — рэльефы на Мемарыяльным музеі М. В. Фрунзе (г. Фрунзе, 1967, маст. А. Варонін, А. Каменскі, С. Бакашоў). Развіваюцца традыц. віды дэкар.-прыкладнога мастацтва — дываначтва, вышыўка, вырабы з скуры, кераміка, тканіны. Іл. гл. на ўкл. II.

Музыка К. заснавана на 7-ступенных дыятанічных ладах, ёй уласцівыя нескладаная рытміка і вельмі разнастайная метрыка. Традыц. нар. песня аднагалосая, інстр. музыка 2- і 3-галосая, асн. жанр — кю (вял. п'еса праграмнага зместу). З нар. муз. інструментаў: камуз (шчыпковы), кыяк (смыковы), чоар (духавы), доал (ударны). Нар. музыканты — акыны, манасчы, камузісты і інш. (з музыкантаў сав. часу вядомыя Тактагул Сатылганаў, Карамалдо Арозаў, Мураталы Куронкееў, Атай Аганбаеў). Прафес. муз. культура пачала развівацца ў паслярэвалюц. час. Паявіліся новыя для К. жанры (опера, балет, сімф. музыка) і формы музіцыравання (шматгалосыя хар. спевы, ансамблевая інстр. ігра). У стварэнні нац. опернага і балетнага рэпертуару ўдзельнічалі У. Уласаў, У. Ферэ, А. *Малдыбаеў*, М. Раўхвергер, М. Абдраеў, К. Малдабасанаў, Г. Окупеў. У жанрах сімф. музыкі працуюць Абдраеў, А. Аманбаеў, А. Джаныбекаў, А. Тулееў, Т. Эрматаў. Малдыбаеў стаў пачынальнікам масавай і дзіцячай песні, рамансаў. Вял. ўвага аддаецца кантатна-аратарыяльнаму жанру. У Фрунзе заснаваны т-р оперы і балета (1942), філармонія (1936), ін-т мастацтва (1966), Вял. сімф. аркестр Кірг. радыё і тэлебачання (1970), Саюз кампазітараў Кірг. ССР (1939). У рэспубліцы 2 муз. вучылішчы (Фрунзе, Ош), 60 муз. школ. Сярод прадстаўнікоў выканальніцкага мастацтва: спевакі С. Кіізбаева, М. Махмутава, А. Мырзабаеў, балерына Б. *Бейшэналіева*.



Дзярж. ансамбль танца Кіргізскай ССР.

Тэатр. Тэатр. элементы былі ў абрадах і нар. гульнях, у спаборніцтвах акынаў (айтыш), выступленнях казачнікаў, манасчы, куудулаў (нар. комікаў). У пач. 20 ст. ў с. Чалпон Нарынскага пав., г. Караколе адбыліся першыя тэатр. паказы на кірг. мове. У 1926 у Фрунзе арганізавана тэатр. студыя, у 1930 ператворана у прафес. т-р (з 1936 муз.-драматычны, з 1942 т-р оперы і балета). Драм. спектаклі на кірг. мове ставіліся Т-рам юнага гледача (1936—41). У 1941 у Фрунзе адкрыўся Кірг. драм. т-р. Ставяцца п'есы Т. Абдумамунава, Б. Амураліева, М. Байджыева, Ш. Бейшэналіева, Б. Джаніева, К. Джантошава, А. Кутубаева, К. Малікава, А. Такамбаева, Р. Шукурбекава, сав., рус. і зарубежная драматургія. Асобнае месца ў рэпертуары займаюць інсцэніроўкі твораў Ч. Айтматава. У кірг. т-рах ставіліся бел. п'есы: «Выбачайце, калі ласка!» (Фрунзенскі рус. т-р імя Крупскай, 1954; Нарынскі кірг. т-р, 1955) і «Лявоніха на арбіце» А. Макаёнка (Джалал-Абадскі кірг. т-р драмы, 1962—63), «Пад адным небам» А. Маўзона (Фрунзенскі кірг. т-р, 1963). Сярод тэатр. дзеячаў (1971): нар. артысты СССР Д. Куюкава, Б. Кыдыкеева і М. Рыскулаў, нар. артысты Кірг. ССР А. Баталіеў, С. Джаманаў, А. Джанкарозава, Н. Кітаеў, А. Кабегенаў, С. Кумушаліева, А. Кутубаева, Л. Маідава, Р. Мумінава, Т. Хасанава, засл. дз. маст. Кірг. ССР Дж. Абдыкадыраў.



Л. А. Ільіна. Буракавод. Каляровая лінагравюра. 1956.

Кіно. Кінавытворчасць узнікла ў канцы 30-х г. У 1942 створана Фрунзенская студыя кінахронікі (з 1956 кінастудыя дакумент.-маст. фільмаў, з 1962 «Кіргізфільм»). Найб. значныя фільмы: «Салтанат» (1955), «Тактагул» (1959), «Дзяўчына з Цянь-Шаня» (1960), «Перавал» (1961), «Спёка» (1963), «Першы настаўнік» (1965), «Джаміля» (1969, з кінастудыяй «Масфільм»).

Літ.: Ленин В. И. О Средней Азии и Казахстане, Ташкент, 1960; Бартольд В. В. Киргизы (Исторический очерк), Фрунзе, 1927; История Киргизской ССР, т. 1—2 (кн. 1—2), Фрунзе, 1968; Орозалиев К. 40 лет Киргизской ССР, Фрунзе, 1966; Киргизстан за годы Советской власти. Стат. сб., Фрунзе, 1970; Киргизия, М., 1970 (Советский Союз); История киргизской советской литературы, М., 1970; Борбугулов М. Пути развития киргизской советской драматургии, Фрунзе, 1958; Бобулов К. Пути развития реализма в киргизской прозе, Фрунзе, 1969; Никипорец Н. Киргизская художественная проза. 1924—1965 гг., Фрунзе, 1970; Самаганов Дж. Писатели Советского Киргизстана (Биобиблиогр. справочник), Фрунзе, 1969; Лазаренко П. И. Архитектура Киргизской ССР. у кн.: Архитектура республик Средней Азии, М., 1951; Изобразительное искусство Киргизской ССР, М., 1957; Иванов С. В. и Махова Е. И. Декоративно-прикладное искусство киргизского народа, М., 1960; Мосолова Л. Изобразительное искусство Киргизии, Фрунзе, 1967; Виноградов В. С. Киргизская народная музыка, Фрунзе, 1958; Ягo ж. Музыка Советского Востока, М., 1968; История советского драматического театра, т. 2—6, М., 1966—71; Львов Н. Киргизский театр, М., 1953; Брудный Д. Л. Театральное искусство Киргизии, М., 1959; Ашимов К. Рождение киргизского кино, Фрунзе, 1969.

Ш. Такамбаеў (прырода), *К. Рахманаў* (насельніцтва, нар. гаспадарка). Фрунзе; *А. А. Прымачонак* (дзяржаўны лад). Мінск; *К. К. Аразаліеў, У. Я. Галіцкі* (гістарычны нарыс), *У. А. Петрасянц* (ахова здароўя), *Н. Кыдырбаева* (літаратура). Фрунзе; *Т. Х. Старадуб* (архітэктура, выяўленчае мастацтва). Масква.

КІРГІЗСКІ УНІВЕРСІТЭТ, вышэйшая навуч. ўстанова. Засн. ў 1951 у г. Фрунзе на базе пед. ін-та (з 1932). Ф-ты ў 1971/72 навуч. г.: гістарычны, юрыдычны, філалагічны, замежных моў, эканамічны, механіка-матэматычны, фізічны, геаграфічны, біялагічны, хімічны. Навучанне дзённае, вячэрняе і завочнае; ёсць аспірантура. Прымае да абароны канд. і доктарскія дысертацыі. Пры ун-це бат. сад, гістарычны музей, астранамічная станцыя, бібліятэка.

КІРГІЗЫ (саманазва кыргыз), нацыя, карэннае насельніцтва Кіргізскай ССР (43,8%). Жывуць таксама ў Узбекістане, Таджыкістане і Казахстане. За межамі СССР — у КНР (Сіньцзян-Уйгурскі аўт. р-н), невялікія групы ў Афганістане. Агульная колькасць паводле перапісу 1970 у СССР 1452 тыс. чал. Гавораць на *кіргізскай мове*, якая адносіцца да цюркскіх моў. Антрапалагічна належаць да паўд.-сібірскага тыпу мангалоіднай расы. Веруючыя К.— мусульмане-суніты.

Асновай кірг. народнасці былі паўд.-сібірскія і частковa цэнтр.-азіяцкія плямёны. Утварэнне ле адбывалася на тэр. Цянь-Шаня, Сіньцзяна, куды ў старажытнасці перасяліліся цюрка- і мангаламорныя плямёны. Сфарміравалася народнасць да 17 ст. У сярэдзіне 19 ст. пачалося добраахвотнае далучэнне К. да Расіі, якое закончылася ў асноўным у 60—70-я г. Яно адыграла прагрэс. ролю ў эканам. і культ. развіцці К. Да Кастр. рэвалюцыі асновай грамадскага ладу К. з'яўляліся патрыярхальна-феад. адносіны. Пры Сав. уладзе К. атрымалі магчымасць стварыць нац. дзяржаўнасць, склалася кірг. сацыяліст. нацыя.

Традыцыйны тып жылля — пераносная юрта. Сустракаецца часам як летняе жыллё. Нац. мужчынскае адзенне — халат, пакрыты кажух. Галаўны ўбор — шапка з аўчыны, белы лямцавы капялюш, цюбецейка. Жаночае адзенне — доўгая шырокая спадніца з яркай тканіны, шаравары, плюшавае ці аксамітавае паліто, жакеты, мяккія боты без абцасаў. Пра гісторыю, гаспадарку і культуру К. гл. ў арт. *Кіргізская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка*.

КІРДЗІШЧАЎ Гаўрыла Фядотавіч (20.3.1919, с. Прыазёрнае Акмолінскага пав.— 13.7.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). На фронце з 1941, нач. заставы 13-га пагран. палка. Мал. лейтэнант К. вызначыўся ў час аховы тылу 3-га Бел. фронту. 1.7.1944 каля в. Рудніца застава разбіла групу праціўніка. 13.7.1944 з 30 воінамі ўступіў у бой супраць 300 гітлераўцаў, быў смяротэльна паранены.

КІРК (Kirk) Ханс (11.1.1898, мяст. Хадсун — 16.6.1962), дацкі пісьменнік. Чл. КПД з 1925. З сям'і ўрача. Па адукацыі юрыст. Друкавацца пачаў у 1925. У раманах «Рыбакі» (1928), «Парабкі» (1936), «Новыя часы» (1939) паказаў працэс сац. развіцця грамадства не праз лёс паасобных герояў, а ў жыцці і барацьбе калектыву. Аўтар сатыр. («Бургамістр падае ў адстаўку», 1941), гістар. («Раб», 1948; «Сын гневу», 1950) і публіцыст. («Грошы д'ябла», 1951—52; «Клітгард і сыны», 1952) раманаў, зб. апавяданняў («Гульня ценяў», 1953; «Грамадзянскія навелы», 1958), публіцыст. артыкулаў.

Літ.: Ханс Кирк. Биобиблиогр. указатель, М., 1967.

КІРКАЗОН (Aristolochia), род шматгадовых травяністых і павойных дрэўных раслін сям. кірказонавых. Каля 180 відаў, пашыраных у трапічных і ўмераных паясах зямнога шара. У СССР 7 відаў, на Беларусі 1 дзікарослы і 3 інтрадукаваныя віды.



Кірказон звычайны: *1* — галінка з кветкамі і лісцем; *2* — кветка; *3* — плод.

Расліны з чаргаваным сэрцападобным лісцем. Кветкі няправільныя, маюць складанае прыстасаванне да перакрыжаванага апылення насякомымі. Плод — каробачка. На Беларусі К. звычайны (A. clematitis) — ядавітая расліна выш. 25—100 см з жаўтаватымі кветкамі, сабранымі ў пучкі; расце ў лясах, на лугах, балотах. К. буйналісты (A. macrophylla) — дрэвавападобная ліяна з вялікім лісцем, вырошчваецца як дэкар. павойная расліна.

КІРКАЎ Георгі (15.8.1867, Плевен — 25.8. 1919), балгарскі грамадскі і рэвалюц. дзеяч, адзін з заснавальнікаў БКП, пісьменнік. З сям'і настаўніка. З 1895 чл. Балг. рабочай с.-д. партыі. У 1879—96 на Украіне, вучыўся

ў паўднёваслав. пансіёне ў Мікалаеве. У 1905—19 сакратар ЦК БРСДП (цесных сацыялістаў), у 1897—1910 рэдактар органа БРСДП «Работнически вестник» («Рабочая газета»). У сатыр. апавяданнях, фельетонах, гумарэсках выкрываў антынар. сутнасць бурж. ладу, з бязлітасным сарказмам высмейваў класавых ворагаў працоўных (зб. «Драміградскія дзівакі», 1900). Некат. вершы сталі папулярнымі песнямі балг. рабочых. К. адзін з пачынальнікаў пралет. л-ры ў Балгарыі.

Тв.: Избрани фейлетони и хумористични разкази, София, 1965.

КІРКІЖ Купрыян Восіпавіч [29.9(11.10).1888, в. Смалянцы Лепельскага пав. Віцебскай губ.— 24.5.1932], савецкі парт. і дзярж. дзеяч. З сялян. Чл. КПСС з 1910. У 1911—12 чл. агіт. калегіі Віцебскага к-та РСДРП, з 1912 на падпольнай парт. рабоце ў Рызе, з 1915 у Харкаве. Пасля Лют. рэв. 1917 чл. Харкаўскага к-та РСДРП(б), Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў, старшыня заводскага раённага к-та РСДРП(б); адзін з арганізатараў Чырв. гвардыі ў Харкаве, на чале 2-га Пралетарскага палка абараняў Харкаў ад ням. акупантаў. У 1919 ваенком асобнай Данецкай брыгады, часцей правага ўчастка Екацярынаслаўскага напрамку. У 1920 нач. тылу і камісар дывізіі, удзельнік баёў супраць Дзянікіна і Махно. У 1922—25 нам. старшыні Харкаўскага губвыканкома, сакратар Харкаўскага губкома КП(б)У. З 1925 заг. арг. аддзела ЦК КП(б)У, з 1926 нарком РСІ УССР. У 1927—29 сакратар ЦК КП(б) Узбекістана. З 1929 старшыня ЦК прафсаюза сав. гандл. служачых, з 1931 — ЦК саюза рабочых машынабудавання. На XIII з'ездзе ВКП(б) выбраны канд. у чл. ЦК, на XIV—XV з'ездах — чл. ЦК ВКП(б), на XVI з'ездзе — чл. ЦКК. Чл. Прэзідыума ВЦСПС (1929—32). Чл. ЦВК СССР, канд. у чл. Прэзідыума ЦВК СССР (1929—31). Узнаг. ордэнам Чырв. Сцяга. Пахаваны на Краснай плошчы ў Маскве.

КІРКОР Адам Ганоры Карлавіч (псеўд. Ян са Слівіна, Ян Валігурскі, Сабары, Яцак; студз. 1819, в. Слівін Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ.— 23.11.1886), беларускі этнограф, археолаг, публіцыст, выдавец, гісторык л-ры, грамадскі дзеяч ліберальнага кірунку. Чл.-кар. Імп. археал. т-ва (1856), чл. Рус. геагр. т-ва (1857), АН у Кракаве (1873). Вучыўся ў Магілёўскай і Віленскай гімназіях. У Вільні выдаваў зб. «Radegast» («Радэгаст», 1843), «Pamiętniki Umysłowe» («Разумовыя дзённікі», т. 1—3, 1845—46), рэдагаваў час. «Teka Wileńska» («Віленскі зборнік», т. 1—6, 1857—58). З 1849 чл. Віленскага стат. камітэта, рэдактар (1850—54) «Памятной книжки Виленской губернии». Увёў у ёй неафіцыйную частку, дзе змяшчаў



свае працы па гісторыі і этнаграфіі Беларусі і Літвы. З 1855 чл. *Віленскай археаграфічнай камісіі*, хавальнік *Віленскага музея старажытнасцей*. Ахвяраваў музею калекцыю сваіх археал. знаходак (у Мінскім, Барысаўскім, Навагрудскім, Віленскім, Троекім, Ашмянскім і Вілейскім пав. раскапаў каля 1000 курганоў). У 1858 выдаў вернападданіцкі «Альбом» у сувязі з прыездам у Вільню Аляксандра II. У 1860—65 рэдактар газ. «Виленский вестник — Kurier Wileński». Узначальваў літоўска-бел. пісьменніцкі гурток. З 1859 уладальнік друкарні, дзе выдаваў танныя літоўскія, рус. і польскія кнігі. У 1868—71 адзін з выдаўцоў газ. «Новое время» ў Пецярбурзе. З 1871 жыў у Кракаве. Выдаў зб. «На сёння» (т. 1—3, Кракаў, 1872), даследаванні «Пра літаратуру братніх славянскіх народаў» (Кракаў, 1874), дзе даў нарыс гісторыі бел. л-ры, «Нарысы сучаснай рускай літаратуры» (Познань, 1873), у якіх высока ацаніў В. Бялінскага, М. Чарнышэўскага, М. Дабралюбава, мемуары аб рэвалюц. руху ў Вільні ў 1-й пал. 19 ст. «Літоўскія абразкі» (Познань, 1874). Працы К. «Літоўскае Палессе» і «Беларускае Палессе» («Живописная Россия», т. 3, ч. 1—2, 1882) пра гісторыю і прыроду Беларусі, матэрыяльную і духоўную культуру бел. народа. У Кракаве кіраваў секцыяй раскопак Археалагічнай камісіі акадэміі навук.

Тв.: Языческие обычаи на Белой Руси, Вильна, 1839; Wycieczka archeologiczna po gubernii Wileńskiej, «Biblioteka Warszawska», 1855, t. 2—4; Przechadzki po Wilnie i jego okolicach, Wilno, 1856; Этнографический взгляд на Виленскую губернию, «Вестник имп. Русского геогр. об-ва», 1857, ч. 20, 1858, ч. 21 (з слоўнікам бел. гаворкі).

Літ.: Зямкевіч Р. Адам Ганоры Кіркор, Вільня, 1911; Климанский С. Новое о Киркоре, «Неман», 1969, № 7; Янчук Н., А.-Г. К. Киркор, ученый исследователь Литвы и Белоруссии, Киев, 1887; Ягож. А. К. Киркор, М., 1888; Brensztejn M. Adam Honory Kirkor, Wilno, 1930.

А. І. Мальдзіс. Мінск.

КІРМАНОВІЧ Уладзімір Мікалаевіч (н. 15.11.1919, г. Кобрын Гродзенскай губ.), Герой Сав. Саюза (1945), палкоўнік (1958). З рабочых. Чл. КПСС з 1943. Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1955). У Чырв. Арміі з 1940. У Айч. вайну на Бранскім, Цэнтр., 4-м Укр. і 2-м Прыбалтыйскім франтах — камандзір знішчальнай процітанкавай батарэі. Вызначыўся ў Латвіі. 22.8.1944 у час варожай танкавай атакі батарэя К. першая прыняла ўдар і ў жорсткім баі падбіла і спаліла 14 варожых танкаў. З 1955 у ваен.-авіяц. вучылішчы, з 1960 у Харкаўскім вышэйшым ваен.-авіяц. вучылішчы лётчыкаў імя двойчы Героя Сав. Саюза С. І. Грыцаўца — выкладчык.



КІРМАШ, перыядычны торг, які наладжваецца ў пэўным месцы і ў пэўны час. Бываюць К. сусв., міжнар., рэгіянальныя, нац. і мясцовыя; універсальныя і спецыялізаваныя.

Узніклі пры першабытнаабшчынным ладзе, калі суседнія плямёны сходзіліся, каб абмяняцца прадуктамі працы. Пашырыліся з развіццём эканам. сувязей паміж гарадамі і краінамі. Прымяркоўваліся да рэлігійных свят ці пэўных пораў году, ад якіх часта паходзяць назвы К. На Беларусі першы К. афіцыйна дазволены ў 1498 у Полацку. Акрамя мясцовага, ён абслугоўваў транзітны гандаль Смаленска з Прыбалтыкай. Замежным купцам дазвалялася гандляваць у бел. гарадах толькі на К., таму К. ператвараліся ў вял. цэнтры міжнар. гандлю. У 15 ст. К. ўзніклі ў Мінску, Оршы, у 16 ст.— у Гродне. У 18 ст. вызначаўся Зэльвенскі К., які абслугоўваў гандлёвы абарот Гродзенскай губ. і суседніх з ёю укр., польскіх, літ. і латв. зямель. Прыкметнае значэнне ў развіцці гандлю мелі Краснічанскі К. у м. Любавічы Магілёўскай губ., Успенскі (Пакроўскі) у м. Прыбарава, Петрапаўлаўскі ў м. Бешанковічы, Васільеўскі, Троіцкі, Узвіжанскі ў Гомелі, Мінскі, Ігуменскі, Навагрудскі. У 1841 было 187 К. з агульным абаротам 1512 тыс. руб., у 1860 адпаведна 205 і 1965, у 1910 — 125 К. з абаротам 1508 тыс. руб. Гандлявалі пераважна зёлкам, футрам, воскам, абожжам, мясам, жывёлай, а таксама таварамі, што прывозілі замежныя гандляры. Пры капіталізме замест збыту наяўных тавараў на К. пашырыўся гандаль па ўзорах прадукцыі, а потым па стандартах. У эпоху імперыялізму вылучыліся лясныя К. ў Гомелі і Мінску, якія дзейнічалі накшталт біржавога гандлю. Пасля Кастр. рэв. К. ажывіліся з пераходам да нэпа. Удзел у іх з прыватнымі гандлярамі прымалі дзярж. і каап. арг-цыі. Агульны іх абарот у 1923—25 складаў каля 560 тыс. руб. за год. На сучасным этапе К. ў СССР развіваюцца як форма рэалізацыі лішкаў тавараў, а таксама як форма сувязі прамысловасці і гандлю. Існуюць К., на якіх рэалізуюцца лішкі машын, абсталявання, інвентару. З міжнар. К. найбольш вядомыя ў Лейпцыгу. Познані, Ліёне, Марселі. Мілане, Ізміры, Дамаску, Брно, Відне. Дэлі, Заграбе. Карачы, футравы аўкцыён у Ленінградзе. На ўсіх міжнар. К., на якіх удзельнічаў СССР, былі ўзоры прадукцыі, выраблена ў БССР.

Літ.: Экономика Белоруссии в эпоху империализма, Мн., 1963; Копысский З. Ю. Экономическое развитие городов Белоруссии в XVI — первой половине XVII в., Мн., 1966; Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии (1795—1861), Мн., 1966; Социально-экономические преобразования в Белорусской ССР за годы Советской власти, Мн., 1970, разд. 4. *Л. М. Міхневіч.* Мінск.

КІРМАШОВЫ ТЭАТР, від народнага тэатра ў шэрагу еўрап. краін 16—18 ст.

Узнік у сярэднія вякі. Атрымаў назву ад выступленняў на кірмашы фокуснікаў, акрабатаў, дрэсіроўшчыкаў, жанглёраў. З 2-й пал. 16 ст. ў К. т. выступалі прафес. акцёры. Ставіліся фарсы, інтэрмедыі, пантамімы. К. т. быў імправізацыйны, злабадзённы, шырока карыстаўся сатыр. жанрамі. За дэмакр. кірунак праследаваўся ўладамі. Дасягнуў росквіту ў Францыі ў 17 ст. У Расіі К. т. дзейнічаў да канца 19 ст. Іспаваў у выглядзе балагана, атракцыёнаў, выступленняў скамарохаў, лялечных т-раў на кірмашах, нар. гульнях. На Беларусі К. т. блізкі да рус. балагана. Пакавы складаліся з акрабатычных нумароў, выступленняў дрэсіраваных мядзведзяў, блазнаў, з інтэрмедый нар. драм. батлейкі.

А. К. Сапнікаў. Мінск.

КІРОЎНЫ СНАРАД, беспілотны лятальны апарат, абсталяваны прыладамі кіравання для руху па зададзенай траекторыі і забяспечаны баявым зарадам (ваенныя К. с.) ці апаратурай для навук. даследаванняў (метэаралагічныя і касм. ракеты).

Ваенныя К. с. падзяляюцца на класы: «зямля — зямля» — балістычныя ракеты, самалёты-снарады, прызначаныя паражаць наземныя і надводныя цэлі на адлегласці да некалькіх тыс. км; «зямля — паветра» — зенітныя рэактыўныя снарады, паражаюць паветр. цэлі; «паветра — паветра» — рэактыўныя снарады для стральбы з самалётаў па паветр. цэлях; «паветра — зямля» — самалёты-снарады, тарпеды, бомбы, паражаюць наземныя і надводныя цэлі з самалётаў. Да К. с. належаць таксама процітанкавыя кіроўныя рэактыўныя снарады (ПТУРСы), снарады-мішэні і інш. Скорасць сучасных К. с. да 5000 *м/сек*, далёкасць лёту да 12 000 *км* і больш, агульная маса да 100 *т*.



Кіроўныя снарады: *1* — снарад для падводных лодак «Паларыс»; *2* — самалётны снарад «Фенікс»; *3* — самалётны снарад «Шрайк».

КІРПІЧ Герасім Аляксеевіч [н. 2(15).1.1909, с. Яцкі Васількоўскага пав. Кіеўскай губ.], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Магілёўскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1937. Скончыў ваен. вуч. (1939), Вышэйшую парт. школу пры ЦК КПСС (1958). З 1931 у Чырв. Арміі. Удзельнік вызвалення Зах. Беларусі (1939), абароны Ваўкавыска, Слоніма, Мінска (1941). У партызанах з ліст. 1942— камандзір групы, атрада, з сак. 1942 камандзір *партызанскай брыгады «Чэкіст»*, з жн. 1943 камандзір Шклоўскай ваен. аператыўнай групы Магілёўскай вобл. Пасля вайны заг. сектара ЦК КП(б)Б, нам. заг. аддзела Мінскага абкома КПБ. З 1958 на сав. рабоце ў Мінску. Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі.

КІРПІЧОЎ Іларыён Паўлавіч [п. 21.10(3.11).1914, в. Якаўлевічы Аршанскага пав. Магілёўскай губ.], Герой Сав. Саюза (1940). З сялян. Чл. КПСС з 1941. Скончыў Ленінградскую вышэйшую афіцэрскую бранятанк. школу (1945), Вышэйшую афіцэрскую школу самаходнай артылерыі (1952). У Чырв. Арміі з 1936. Удзельнік сав.-фінляндскай вайны 1939—40. Вызначыўся 22.2.1940. Камандзір танка К. даставіў сав. часці, акружанай ворагам, акумулятары для рацыі, каб наладзіць сувязь з брыгадай. Пасля выканання задання танк К. наскочыў на варожую міну, якая пашкодзіла гусені-



цу. Фіны акружылі танк. Экіпаж на чале з К. больш за суткі адбіваў націск ворага. У Айч. вайну ўдзельнічаў у абароне і вызваленні Паўн. Каўказа. З 1960 падпалкоўнік К. у запасе. Жыве ў Ленінградзе.

КІРПІЧОЎ Міхаіл Віктаравіч [11(23).8.1879, Пецярбург — 10.1.1955], савецкі вучоны ў галіне цеплатэхнікі. Акад. АН СССР (1939, чл.-кар. 1929). Скончыў Пецярбургскі тэхнал. ін-т (1907). З 1907 выкладчык Пецярбургскага (Ленінградскага) політэхн. ін-та, з 1933 у Энергетычным ін-це АН СССР. Працаваў у Ленінградскім фіз.-тэхн., Цэнтр. котлатурбінным і інш. ін-тах. Навук. працы па цеплатэхніцы і тэорыі падобнасці. Сфармуляваў трэцюю тэарэму падобнасці (тэарэма Кірпічова — Гухмана). Дзярж. прэмія СССР 1941. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга.



Тв.: О теплопередаче в котлах, у кн.: Успехи тепловой техники, Л., 1924; (разам з М. А. Міхеевым) Моделирование тепловых устройств, М.— Л., 1936; Теория подобия как основа эксперимента, «Известия АН СССР. Отделение техн. наук», 1945, № 4—5.

Літ.: М. В. Кирпичев, «Теплоэнергетика», 1955, № 2.

КІРСА́НАЎ Аляксандр Васілевіч [н. 11(23).12.1898, Казань], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1922. У Чырв. Арміі з 1920. На фронце з 1941, камандзір стралк. дывізіі на Сталінградскім, Бранскім, Цэнтр. і Бел. франтах. Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра. У ноч на 28.9.1943 дывізія пад камандаваннем ген.-маёра К. пераправілася цераз Дняпро ў Брагінскім р-не Палескай вобл., захапіла плацдарм і адбіла ўсе варожыя контратакі. Пасля вайны жыве ў Мінску, працуе ў БДУ.

КІРСА́НАЎ Аляксандр Трафімавіч [15(27).8.1880, Старое Чыркава Хвалынскага пав. Саратаўскай губ.— 30.10.1941], беларускі савецкі аграхімік. Д-р с.-г. н., праф. (1909). Скончыў с.-г. ін-т у Берліне (1908). У 1913—25 кіраўнік Мінскай балотнай станцыі, рэктар Бел. ін-та сельскай і лясной гасп. (1922—25). У 1931—41 заг. лабараторыі аграхіміі Глебавага ін-та АН СССР, потым Усесаюзнай акадэміі с.-г. навук. У 1923—27 чл. ЦВК БССР. Аўтар метаду вызначэння даступнай (рухомай) P_2O_5 для раслін у глебе. Асн. працы па вывучэнні балотаў, вапнаванні і ўрадлівасці глебаў. Вывучаў балотныя масівы Беларусі.

Тв.: К вопросам опытного изучения болот Полесья в целях культуры, Мн., 1914 (Труды Минской районной опытной болотной станции, № 1); Известкование как фактор урожайности, 2 изд., М.— Л., 1930.

КІРУ́НКІ СВЕ́ТУ, чатыры галоўныя пункты гарызонту: поўнач, поўдзень, захад і ўсход. Абазначаюцца Пн, Пд, З і У ці адпаведна N, S, W і O (або E), што адпавядае ням. Nord, Süd, West і Ost (англ. East). К. с. вызначаюць для арыентавання на мясцовасці (найчасцей з дапамогай компаса, па Сонцы і па зорках).

КІРУ́ШКІН Мікалай Сяргеевіч [14(27).12.1914, в. Вялікія Нямкі Гомельскага пав. Магілёўскай губ.— 4.6.1944], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Палескай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1943. Скончыў школу НКУС (1939). З 1936 у Чырв. Арміі. З 1939 на сав. рабоце ў Пінску. У партызанах з жн. 1941 — камандзір роты, нам. камандзіра атрада; з снеж. 1943 камісар *партызанскай брыгады Мазырскай* імя Аляксандра Неўскага Палескай вобл. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.

КІРХГОФ (Kirchhoff) Густаў Роберт (12.3.1824, Кёнігсберг — 17.10.1887), нямецкі фізік. Чл. Берлінскай АН (1874), праф. Гейдэльбергскага ун-та (1854). Вызначыў (1847) заканамернасці цячэння эл. току ў разгалінаваных ланцугах *(Кірхгофа правілы)*. Увёў у фізіку паняцці эл. патэнцыялу і абс. чорнага цела, сфармуляваў (1859) асн. закон выпрамянення (гл. *Кірхгофа закон*). К. і Р. Бунзен стварылі асновы спектральнага аналізу, з дапамогай якога адкрылі элементы цэзій (1860) і рубідый (1861).

Літ.: Столетов А. Г., Г. Р. Кирхгоф, Собр. соч., т. 2, М.— Л., 1941.

КІРХГО́ФА ЗАКО́Н, адзін з асноўных законаў выпрамянення, паводле якога адносіны спектральнай шчыльнасці раўнаважнага выпрамянення $P(\lambda, T)$ любой тэмпературнай крыніцы (пры адвольнай даўжыні хвалі λ і т-ры T) да яго каэфіцыенту паглынання $\alpha(\lambda, T)$ не залежаць ад уласцівасцей матэрыялу, які выпрамяняе, і з'яўляюцца універсальнай функцыяй ад λ і T. Гэтыя адносіны роўныя спектральнай шчыльнасці раўнаважнага выпрамянення *абсалютна чорнага цела* $P_0(\lambda, T)$. Матэм. запіс К.з.: $\frac{P(\lambda, T)}{\alpha(\lambda, T)} = P_0(\lambda, T)$.

КІРХГО́ФА ПРА́ВІЛЫ, правілы для разгалінаваных ланцугоў эл. току. Сфармуляваны Г. Р. *Кірхгофам* у 1847.

Першае правіла: для кожнага пункта разгалінавання праваднікоў арыфм. сума ўсіх токаў, што да яго прыцякаюць, роўная суме токаў, што з яго выцякаюць. Другое правіла: у адвольным замкнёным контуры любога разгалінаванага эл. ланцуга алг. сума падзенняў напружанняў уздоўж контура роўная алг. суме старонніх *электрарухальных сіл*, уключаных у гэты контур. К. п. выкарыстоўваюцца для ланцугоў пастаяннага току і пераменнага току нізкай частаты. Даюць магчымасць вызначаць велічыні і кірункі токаў, калі вядомы ўсе супраціўленні і электрарухальныя сілы.

КІРХНЕР (Kirchner) Петэр (н. 7.7.1932, г. Гале), нямецкі літаратуразнавец-славіст. Чл. САПГ з 1960. Скончыў ун-т Марціна Лютэра ў Гале (1955). З 1961 навук. супрацоўнік Цэнтр. ін-та гісторыі л-ры Нямецкай АН у Берліне. Даследуе л-ру народаў СССР, пераважна ўкраінскую. Даследчык і перакладчык бел. л-ры, аўтар арт. пра творчасць Я. Брыля, І. Мележа, І. Шамякіна.

КІРЧЭ́НКА Фёдар Пятровіч [3(15).3.1897, в. Бабчын Рэчыцкага пав. Мінскай губ.— 17.3.1967], удзельнік грамадз. вайны, ген.-м. (1958). З сялян. Чл. КПСС з 1919. Скончыў курсы ўдасканалення каманднага саставу (1929, 1931). У Чырв. Арміі з крас. 1919. У 1920 удзельнічаў у баях супраць польскіх інтэрвентаў. З 1921 у часцях і штабе ваен. акругі. У Айч. вайну на Ленінградскім, Паўд.-Зах., Паўд., Паўн.-Каўказскім, Паўд.-Усх., Сталінградскім і 4-м Укр. франтах — нач. аддзела штаба фронту. З 1946 нач. аддзела штаба ваен. акругі. У 1952—59 нам. нач. ўпраўлення Ген. штаба Сав. Арміі. З 1959 у запасе. Узнаг. ордэнам Леніна, 5 інш. ордэнамі, медалямі.

КІРЧЭ́ЎСКІ Мікалай Фёдаравіч [н. 19.11(2.12).1900, в. Новая Серабранка Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ.], удзельнік грамадз. вайны, ген.-м. інж. войск (1943). З служачых. Скончыў Ваен.-інж. акадэмію (1937). У Чырв. Арміі з мая 1919. У 1920 на Зах. фронце. З 1937 нач. інж. службы корпуса, нач. будаўнічага ўчастка. Удзельнік сав.-фінляндскай вайны 1939—40. У Айч. вайну на Паўн., Ленінградскім, 3-м Прыбалт. франтах — нач. ваен.-палявога буд-ва, нач. інж. войск арміі і фронту. З 1945 нач. інж. войск ваен. акруг. У 1951—60 нам. нач. Ваен.-інж. акадэміі. З 1960 у запасе. Узнаг. ордэнам Леніна, 7 інш. ордэнамі, медалямі. Жыве ў Маскве.

КІРШЫ́, вёска ў Заслаўскім с/с Мінскага р-на. Цэнтр саўгаса імя Жданава. За 29 *км* на ПнЗ ад Мінска, 2 *км* ад чыг. ст. Беларусь. 250 ж., гасп. 67 (1971). Пач. школа. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

КІРЫК Іван Васілевіч [20.6(3.7).1911, с. Новае Дняпровае Асцёрскага пав. Чарнігаўскай губ.— 28.9.1943], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). На фронце з 1943. Вызначыўся ў Брагінскім р-не Палескай вобл. У ноч на 28.9.1943 у складзе штурмавой групы пераправіўся цераз Дняпро, уварваўся ў варожыя траншэі, выратаваў жыццё камандзіра, закрыўшы яго сваім целам. Пахаваны ў в. Мысы Чарнігаўскай вобл.

КІРЫ́ЛА І МЯФОДЗІЙ, браты, славянскія асветнікі. Кірыла (свецкае імя Канстанцін; 826 ці 827 — 14.2.869) і Мяфодзій (815 — 6.4.885) родам з Салуні (Саланікі, Паўн. Грэцыя), дзе ў той час было шмат слав. насельніцтва. Запрошаныя ў 862—863 мараўскім князем Расціславам у Маравію для стварэння слав. царквы, каб процістаяць германізацыі, К. і М. склалі слав. азбуку і пераклалі з грэч. мовы на балг.-макед. дыялект асн. царк. кнігі, даўшы пачатак пісьменнасці на *стараславянскай мове*. Асн. крыніцы пры вывучэнні жыцця і дзейнасці К. і М.— іх жыціі, вядомыя пад назвай «Панонскія легенды».

Літ.: Тържествена сесия за 1100 годишнината на славянската писменост, София, 1965.

КІРЫ́ЛА КАЖАМЯ́КА, герой усх.-слав. казак-легенд, асілак, пераможца змея. У іх зліліся матывы міжнар. сюжэта пра вызваленне царэўны і мясцовага падання Кіеўскай Русі. Паданне вядомае па «Аповесці мінулых часоў», «Ніканаўскім летапісе», «Паважнай кнізе» 16 ст., дзе герой называецца Янам Усмашэўцам («усмие» — шкура). Мае тыповую для фалькл. апавядання схему: юны рамеснік можа вырваць кавалак шкуры ў разагнанага быка, разарваць сырамятную шкуру; перамогай над волатам-печанегам ён вырашае вынікі вайны з печанегамі на карысць Русі; на месцы гэтай перамогі князь Уладзімір закладае ў 992 г. Пераяслаў. У шэрагу бел., укр. казак Кажамяка завецца Кірылам. У рус. казцы (зб. А. М. Афанасьева) Мікіта Кажамяка ўзорвае на запрэжаным у плуг змеі вялізную баразну (падобны фінальны эпізод некат. укр. казак тыпу «Бой на мосце»). Гэта адпавядае паданню 10 ст. пра Змееў вал на Украіне. Бел. казкі пра Кажамяку — у зб. Е. Раманава, П. Шэйна. Варыянт зб. Раманава падобны да польскага падання пра Крака і Змея, што жыў у пячоры.

Літ.: Повесть временных лет, ч. 1—2 (т. 1, с. 84—85, т. 2, с. 346—348), М.— Л., 1950; Азбелев С. Н. Летописание и фольклор, у кн.: Русский фольклор, в. 8, М.— Л., 1963; Кулжинский Я. Как сложилась сказка о Кирилле Кожемяке, СПб.— Киев, 1911; Беларускі эпас, Мн., 1959, с. 81—84, 294.

Л. Р. Бараг. Уфа.

КІРЫ́ЛА ТУРАЎСКІ (каля 1130, Тураў — каля 1182), славуты дзеяч старажытнарускай л-ры. З сям'і багатых гараджан. У Тураве атрымаў высокую на той час адукацыю. Пастрыгшыся ў манахі, заняўся літ. дзейнасцю. Пачаў яе па ўзорах візант. л-ры. Стаўшы тураўскім епіскапам, асабліва праславіўся як прапаведнік, выдатны майстар т. зв. ўрачыстага царк. красамоўства. Бясспрэчна ягонымі лічацца 8 «слоў», або павучанняў, 3 прытчы [«Прытча пра душу і цела (пра сляпога і кульгавага)», «Аповесць пра бяспечнага цара і яго мудрага саветніка», «Казанне пра чарнарызскі чын»], каля 30 малітваў і некалькі канонаў. Арыгінальны, выключнай вобразна-выяўленчай сілы паэт. дар К. Т. найб. выявіўся ў «словах». Звязаныя з біблейскімі сюжэтамі, пропаведдзю хрысціянскіх догмаў, яны адлюстравалі і натуральнае чалавечае захапленне хараством прыроды, духоўнымі пошукамі чалавека, цнатлівасцю, маральнай чысцінёю. «Словы» К. Т. вызначаюцца багатай паэт. сімволікай, хараством і велічнасцю вобразаў, узнёсласцю і паэтыкай. Яшчэ пры жыцці аўтара яго літ. творчасць была высока ацэнена сучаснікамі, якія называлі К. Т. «Златоуст, паче всех воссиявший нам на Руси». Казанні К. Т. ўключалі ў «Златоуст» і «Торжественник» — анталогіі лепшых узораў ка-

Першая старонка аднаго са «слоў» К. Тураўскага паводле спісу 13 ст.



занняў найб. славутых грэч. майстроў аратарскага красамоўства. Творы яго перапісваліся да 19 ст.

Літ.: Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры, т. 1, Мн., 1968, с. 82—85; Хрэстаматыя па старажытнай беларускай літаратуры, Мн., 1959; Еремин И. П. Литературное наследие Кирилла Туровского, «Труды Отдела древнерусской литературы», 1955, № 11, 1956, № 12, 1957, № 13, 1958, № 15; яго ж. Ораторское искусство Кирилла Туровского, там жа, 1962, т. 18.

А. А. Лойка. Мінск.

КІРЫЛА-МЯФОДЗІЕЎСКАЕ ТАВАРЫСТВА, тайная паліт. арганізацыя ў Кіеве ў студз. 1846—47. Налічвала некалькі дзесяткаў членаў. Арганізатары М. І. Кастамараў, М. І. Гулак, В. М. Белазерскі; актыўныя чл. Г. У. Андрузскі, І. Я. Пасяда (Пасядэнка), А. В. Марковіч, А. А. Наўроцкі, М. І. Савіч, П. А. Куліш; у крас. 1846 уступіў Т. Р. Шаўчэнка, які прытрымліваўся рэвалюц.-дэмакр. поглядаў. Гал. мэта т-ва — стварыць слав. дэмакр. рэспублікі (14 штатаў), аб'яднаныя на федэратыўных прынцыпах у адзіны Славянскі Саюз, са сталіцай у Кіеве. Беларусь складала асобны штат. Меркавалася заканадаўчую ўладу перадаць 2-палатнаму сейму, выканаўчую — прэзідэнту. Праграмай прадугледжвалася ліквідаваць царызм, прыгонніцтва. Аднак т-ва стаяла на ідэаліст. пазіцыях і меркавала ажыццявіць праграму мірным шляхам.

Праграмныя палажэнні выкладзены ў Статуце і т. зв. «Законе божым». На Статут уплывала *Таварыства з'яднаных славян* і польскае Т-ва аб'яднаных братоў, якое ўзнікла ў Парыжы пры ўдзеле А. Міцкевіча. На «Законе божым» адчуваўся ўплыў «Кнігі народа польскага і пілігрымства польскага» А. Міцкевіча. Члены т-ва распаўсюджвалі асвету ў народзе, вербавалі новых членаў (кожны член мог самастойна прымаць у т-ва новых людзей). Знак т-ва — плоскі залаты пярсцёнак з надпісам: «Св. Кірыла і Мяфодзій, студзень 1846» — адсюль назва т-ва. Па даносу правакатара ў сак. 1847 кіраўнікі т-ва арыштаваны. Найб. цяжка пакараны Шаўчэнка (здадзены ў салдаты) і Гулак (зняволены ў Шлісельбургскую крэпасць).

Літ.: Зайончковский П. А. Кирилло-Мефодиевское общество (1846—1847). М., 1959.

В. С. Семенякоў. Мінск.

КІРЫЛАЎ Кузьма Маркавіч (1903, мяст. Дуброўна Горацкага пав. Магілёўскай губ.— 24.6.1944), адзін з кіраўнікоў партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1928. З 1916 рабочы, з 1930 на прафс., сав. і парт. рабоце ў Віцебскай вобл. У 1940—41 — сакратар Міёрскага райкома КП(б)Б. У партызанах з ліп. 1941 — камандзір дыверсійнай групы, камісар атрадаў 1-й Дрысенскай, потым імя А. Ф. Данукалава, Лёзненскай партыз. брыгады; з 15.4.1944 камісар *партызанскай брыгады Лёзненскай* Віцебскай вобл. Загінуў у баі. Узнаг. ордэнам Чырв. Зоркі, медалём.

КІРЫЛАЎ Міхаіл Сямёнавіч (1921, с. Усць-Алеус Барнаульскага пав. Томскай губ.— 1950), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). На фронце з 1944, камандзір аддз. разведкі. Вызначыўся 27.7.1944. Аддзяленне на чале з К. фарсіравала Дняпро каля в. Буйнічы на Пд ад Магілёва, захапіла плацдарм, знішчыла агнявыя кропкі праціўніка, гэтым забяспечыла пераправу батальёна.

КІРЫЛАЎ Пётр Іванавіч [н. 2(15).2.1908, в. Навагольскае Новахапёрскага пав. Варонежскай губ.], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Віцебскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1932. Скончыў Тбіліскае ваен. вуч. (1929). З 1926 у Чырв. Арміі. У партызанах з жн. 1941 — камандзір групы, атрада, кіраўнік групы партыз. атрадаў у Багушэўскім і Сенненскім р-нах; з мая 1943 камандзір *партызанскай брыгады Лёзненскай* Віцебскай вобл. Пасля вайны інструктар ЦК КП(б)Б, заг. аддзела Мінскага абкома, сакратар Бярэзінскага райкома КП(б)Б. З 1953 на сав., гасп. рабоце. Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі. Жыве ў Беразіне.

КІРЫЛАЎ Уладзімір Якаўлевіч (н. 17.9.1923, в. Афіміна Вятлужскага пав. Кастрамской губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). У Чырв. Арміі з 1941, матрос Дняпроўскай ваен. флатыліі. Вызначыўся ў чэрв.— ліп. 1944 у Палескай і Пінскай абл. У баі за в. Скрыгалаў захапіў варожы бліндаж са зброяй і боепрыпасамі; каля Петрыкава і в. Дарашэвічы знішчыў варожы дзот і 2 мінамёты. 12.7.1944 з групай дэсантнікаў высадзіўся ў занятым ворагам Пінску, выявіў фаш. склады і агнявыя кропкі. У двухдзённых баях з яго ўдзелам адбіта 16 варожых контратак. Жыве на радзіме.

КІРЫЛЕНКА Андрэй Паўлавіч [н. 26.8(8.9). 1906, Аляксееўка Карочанскага пав. Курскай губ.], савецкі дзярж. і парт. дзеяч. Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1931. Скончыў Рыбінскі авіяц. ін-т (1936). З 1925 на прадпрыемствах Варонежскай вобл. і на шахце ў Данбасе. У 1929—30 на камсамольскай і сав. рабоце. З 1936 інжынер-канструктар на авіязаводзе. У 1938 сакратар Варашылаўскага райкома КП(б)У ў Запарожжы; у 1939—41 сакратар Запарожскага абкома КП(б)У. У Айч. вайну чл. Ваен. савета 18-й арміі Паўд. фронту, упаўнаважаны Дзярж. К-та Абароны на авіяц. з-дзе ў Маскве (1942—44). З 1944 сакратар Запарожскага, з 1947 першы сакратар Мікалаеўскага, з 1950 сакратар Днепрапятроўскага абкомаў КП(б)У; у 1955—62 першы сакратар Свярдлоўскага абкома КПСС. У 1962—66 першы нам. старшыні Бюро ЦК КПСС па РСФСР. З крас. 1966 сакратар ЦК КПСС. На XX, XXII—XXIV з'ездах КПСС выбраны чл. ЦК. У 1957—61 канд. у чл., у 1962—66 чл. Прэзідыума, з крас. 1966 чл. Палітбюро ЦК КПСС. Дэп. Вярх. Савета СССР 3—8-га скл. Узнаг. 5 ордэнамі Леніна, медалямі.



КІРЫЛІН Уладзімір Аляксеевіч [н. 7(20).1. 1913, Масква], савецкі дзярж. дзеяч, вучоны ў галіне тэрмадынамікі і фізічных асноў цеплатэхнікі. Акад. АН СССР (1962; чл.-кар. 1953). Чл. КПСС з 1937. З сям'і служачых. У 1936



скончыў Маскоўскі энерг. ін-т, працаваў у ім да 1954, з 1952 прафесар. У 1941—43 у Сав. Арміі. У 1954—55 нам. міністра вышэйшай адукацыі СССР, з 1955 нам. старшыні Дзярж. к-та па новай тэхніцы пры Савеце Міністраў СССР. У 1963—65 віцэ-прэзідэнт АН СССР. З 1965 нам. Старшыні Савета Міністраў СССР і старшыня Дзярж. к-та Савета Міністраў СССР па навуцы і тэхніцы. К. належаць фундаментальныя даследаванні тэрмадынамічных уласцівасцей вады і пары. Навук. працы па тэрмадынамічных уласцівасцях цвёрдых рэчываў пры 2500—3000 °С, па непасрэдным ператварэнні цеплавой энергіі ў электрычную (удзельнічаў у стварэнні магнітагідрадынамічных генератараў). На XXII з'ездзе КПСС выбраны канд. у чл. ЦК, на XXIII—XXIV з'ездах — чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета СССР 6—8-га скл. Дзярж. прэмія СССР 1951, Ленінская прэмія 1959. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.

Тв.: (Разам з А. Я. Шэйдліным) Водяной пар в энергетике, М.— Л., 1953; (з ім жа). Термодинамика растворов, М.— Л., 1956; (з ім жа). Исследование термодинамических свойств веществ, М.— Л., 1963; Техническая термодинамика, М., 1968.

КІРЫЛІЦА, адна з дзвюх (гл. *Глаголіца*) найстаражытнейшых славянскіх азбук. Назва ад імя слав. асветніка Кірылы (гл. *Кірыла і Мяфодзій*). Створана ў 9 ст. на аснове грэч.-візант. ўстаўнага пісьма. Адрозніваецца ад глаголіцы простаю і выразнаю формаю літар.

Кірыліца		Грэчаскае ўстаўнае пісьмо	Кірыліца		Грэчаскае ўстаўнае пісьмо
Літары і іх назвы	Лічбавае значэнне		Літары і іх назвы	Лічбавае значэнне	
А — аз	1	А	Х — хер	600	Х
Б — буві			Ѡ — амега	800	Ѡ
В — ведзі	2	В	Ц — цы	900	
Г — глаголь	3	Г	Ч — чэрв	90	
Д — добро	4	Д	Ш — ша		
Є — есць	5	Є	Щ — шта		
Ж — жывеце			Ъ — ёр		
Ѕ — зало	6	Ѕ	Ы — еры		
Ꙁ — земля	7	Ꙁ	Ь — ер		
І — і	10	І	Ѣ — яць		
Н — імя	8	Н	Ю — ю		
К — кана	20	К	Ꙗ — я		
Л — людзі	30	Л	Ѥ — е		
М — мысліце	40	М	Ѧ — юс малы		
Н — наш	50	Н	Ѫ — юс вялікі		
О — он	70	О	Ѩ — етаваны юс малы		
П — покой	80	П	Ѭ — етаваны юс вялікі		
Р — рцы	100	Р	Ѯ — ксі	60	Ѯ
С — слова	200	С	Ѱ — псі	700	Ѱ
Т — тверда	300	Т	Ѳ — фіта	9	Ѳ
Ѹ — ук	400		Ѵ — ітыца		Ѵ
Ф — ферт	500	Ф			

Мела 43 (11 ст.) літары: 24 візант. паходжання, 19 створаных самастойна. 27 літар выкарыстоўвалася для абазначэння лічбаў. Алфавітна-літарны склад К. адпавядаў гукавой сістэме *стараславянскай мовы.*

Паходжанне К. канчаткова не высветлена. Большасць вучоных лічыць, што К. створана раней за глаголіцу. Найб. стараж. кірыліцкія помнікі: надпісы на сценах і плітах царквы ў Праславе (9—10 ст.), надпіс на глінянай пасудзіне, знойдзенай пры раскопках курганоў пад Смаленскам (10 ст.). Першая датаваная кніга, напісаная кірыліцай,— *Астрамірава евангелле* (1056—57). Напачатку К. ўжывалася ў большасці слав. краін паралельна з глаголіцай, з 12 ст. выцясняе глаголіцу. У Польшчы і Чэхіі пад уплывам каталіцызму выцеснена лац. пісьмом.

У 14—18 ст. К. шырока ўжывалася ў бел. пісьменнасці. У працэсе развіцця беларуская графіка пазбавілася паасобных лішніх літар („ѫ", „ѥ"), паявіліся графемы «й» і «э», для абазначэння гукаў у помніках дзелавых жанраў перасталі ўжывацца знакі „і", „ѵ", „ѯ", „ѱ", „ѕ", „ф".

Працэс удасканалення кірылаўскага алфавіта спыніўся на Беларусі ў 18 ст. ў выніку заняпаду пісьменнасці. На рус. землях К. развівалася без перашкод. Для яе ўдасканалення вял. значэнне мела рэформа 1708, паводле загаду Пятра І. У выніку на базе К. быў створаны грамадзянскі шрыфт, які потым стаў асноваю алфавітаў большасці народаў СССР, акрамя грузінскага, армянскага, літоўскага, латышскага і эстонскага. Сістэмы пісьма, заснаваныя на К., ужываюцца ў Балгарыі, Югаславіі, Мангольскай Народнай Рэспубліцы.

Літ.: Карский Е. Ф. Славянская кирилловская палеография, Л., 1928; Истрин В. А. 1100 лет славянской азбуки, М., 1963; Лоукотка Ч. Развитие письма, пер. с чеш., М., 1950.

А. М. Булыка. Мінск.

КІРЫЛЬЧАНКА Пётр Міхайлавіч [н. 5(18). 10.1914, Екацярынадар], беларускі савецкі альтыст, педагог і дырыжор. Засл. арт. БССР (1961). У 1939—48 вучыўся ў Ленінградскай кансерваторыі. У 1938—41 працаваў у Горкім (сімф. аркестр філармоніі, т-р оперы і балета). У 1944—62 саліст Дзярж. сімф. аркестра БССР, удзельнік струннага квартэта Бел. філармоніі, з 1945 педагог Бел. кансерваторыі, з 1970 гал. дырыжор Дзярж. т-ра муз. камедыі БССР.

КІРЫНОВІЧ Іван Уладзіміравіч (н. 12.1. 1937, в. Ягаднае Асіповіцкага р-на), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1964. У 1956—70 трактарыст Асіповіцкай МТС, калгаса «1 Мая», саўгаса «Асіповіцкі» Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл.; з 1970 майстар-наладчык саўгаса «Асіповіцкі».

КІРЫЧУК Васіль Паўлавіч (16.1.1924, с. Славатычы Луцкага пав. Валынскай губ.— 13.7.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). На фронце з 1944. Вызначыўся ў Бешанковіцкім р-не Віцебскай вобл. 25.6.1944 К. у ліку першых пад агнём праціўніка пераправіўся цераз Зах. Дзвіну, захапіў плацдарм і агнём прыкрываў пераправу роты. Пахаваны ў Паставах.

КІРЫЧЭНКА Віктар Лук'янавіч (н. 19.8.1935, ст. Ліскі Варонежскай вобл.), беларускі савецкі спявак (лірычны тэнар). Засл. арт. БССР (1968). Чл. КПСС з 1966. Пасля заканчэння Маск. кансерваторыі (1963) у Бел. т-ры оперы і балета. З партый: Мільчык і Уронак («Яснае світанне» А. Туранкова), Пётр («Зорка Венера» Ю. Семянякі), Сашка («Андрэй Касценя» М. Аладава), Лепскі («Яўген Анегін» П. Чайкоўскага), Альмавіва («Севільскі цырульнік» Дж. Расіні), Альфрэд, Герцаг, Касіо («Травіята», «Рыгалета» і «Атэла» Дж. Вердзі), Фаўст («Фаўст» Ш. Гуно), Надзір («Шукальнікі жэмчугу» Ж. Бізэ), Рудольф («Багема» Дж. Пучыні). У канцэртным рэпертуары К. шмат бел. твораў. Гастраляваў у Польшчы, Балгарыі, ГДР.

КІРЭЕНКА Кастусь (Канстанцін Ціханавіч; н. 12.12.1918, мяст. Гайшын Быхаўскага пав. Магілёўскай губ.), беларускі савецкі паэт. Засл. дз. культ. БССР (1970). Чл. КПСС з 1946. З сялян. Скончыў Гомельскі пед. ін-т (1940). З 1940 у Чырв. Арміі. У Айч. вайну карэспандэнт армейскай газ. «За Родину», удзельнік абароны Масквы, вызвалення Беларусі і Польшчы. Заг. аддзела л-ры час. «Беларусь» (1945—62), з 1962 гал. рэдактар час. «Бярозка». Друкуецца з 1939. Як паэт сфарміраваўся ў Айч. вайну («Ранак ідзе», 1945). Паэзія К. вызначаецца публіцыст. і грамадз. страснасцю, рамант. узнёсласцю, патрыят. пафасам, лірызмам. Яна ўслаўляе веліч спраў сав. чалавека, прасякнута замілаваннем да роднай прыроды. К. піша і для дзяцей (паэма «Алёнчына школа», 1951; кн. «Зялёнае рэха», 1953; «Урачыстая песня», 1965; і інш.). Аўтар аповесці «Сум і радасць дзеда Рэпкі» (1967), зб. «Смага» (1962, літ. прэмія імя Я. Купалы 1963), «Кнігі ста песень» (1971). Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі.



Тв.: Пасля навальніцы, Мн., 1947; Мая рэспубліка, Мн., 1949; Маякі, Мн., 1952; Родны свет, Мн., 1952; Любоў і дружба, Мн., 1955; Светлая хваля, Мн., 1959; Слаўся, юнацтва, Мн., 1961; Жывыя ідуць наперад, Мн., 1964; Цёплая радуга, Мн., 1966; Ручаіны шукаюць ракі, Мн., 1967; Выбраныя творы, т. 1—2, Мн., 1969; Амерыка здалёку і вблізку, Мн., 1971; Незабыўнае, у кн.: Пяцьдзесят чатыры дарогі, Мн., 1963.

Літ.: Вяровкін Р. Паэты аднаго пакалення, «Полымя», 1960, № 7; Лойка А. Тэмперамент лірыка, там жа, 1967, № 6; Арочка М. Паэзія адданасці і веры, там жа, 1971, № 4.

Ю. С. Пшыркоў. Мінск.

КІРЭЕЎСКІ Пётр Васілевіч [11(23).2.1808, в. Долбіна Ліхвінскага пав. Калужскай губ.— 25.10(6.11).1856], рускі фальклярыст, збіральнік усх.-слав. песень. У 30-я г. збіраў фальклор на Беларусі. А. Пушкін, М. Языкаў, У. Даль, М. Гогаль, Р. Падбярэскі і інш. перадалі яму запісы бел., рус. і ўкр. песень, М. Палявой і М. Пагодзін — свае і частку запісаў З. Даленгі-Хадакоўскага, ідэі якога абудзілі цікавасць К. да нар. паэзіі і сталі асновай яго фальк. канцэпцыі. У 1848 выдаў духоўныя вершы пад назвай «Рускія народныя песні», куды ўвайшлі і беларускія. Бел. матэрыялы ў сваім зборы К. вылучыў у асобную калекцыю — «Беларускі архіў», частку якіх П. А. Бяссонаў уключыў у свае зб. «Даіцячыя песні» (1868) і «Беларускія песні» (1871). Бел. рукапісныя матэрыялы К. ў Дзярж. гістар. музеі і Цэнтр. дзярж. архіве л-ры і маст. ў Маскве.

Публ.: Песни, собранные П. В. Киреевским, в. 1—10, М., 1860—74; тое ж. Новая серия, в. 1—2 (ч. 1—2), М., 1911—29.

Літ.: Соймонов А. Д., П. В. Киреевский и его собрание народных песен, Л., 1971; Песни, собранные писателями. Новые материалы из архива П. В. Киреевского, М., 1968 (Литературное наследство, т. 79). *Л. А. Малаш-Аксамітава.* Мінск.

КІРЭНСКІ Леанід Васілевіч [25.3(7.4).1909, в. Амгінская Якуцкай акр.— 3.11.1969], савецкі фізік. Акад. АН СССР (1968, чл.-кар. 1964). Герой Сац. Працы (1969). Чл. КПСС з 1943. Скончыў Маск. ун-т (1936). У 1940—56 заг. кафедры фізікі Краснаярскага пед. ін-та, з 1957 дырэктар Ін-та фізікі Сібірскага аддз. АН СССР. Асн. працы па фізіцы магн. з'яў і ў галіне стварэння спец. біёлага-тэхн. сістэм. Стварыў сібірскую школу магнітолагаў. Дэп. Вярх. Савета СССР 5—7-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.



Тв.: (У саав.) Динамическая магнитострикция железа, М.— Люберцы, 1964; (у саав.) Температурный магнитный гистерезис ферромагнетиков и ферритов, Новосибирск, 1965; Магнетизм, 2 изд., М., 1967.

Літ.: Леонид Васильевич Киренский, «Успехи физических наук», 1969, т. 98, в. 1; Леонид Васильевич Киренский, там жа, 1970, т. 101, в. 1.

КІСЕЛЬ, дэсертная страва з соку ягад і садавіны. Варыцца на крухмале. На Беларусі пашыраны таксама аўсяны К.— *жур.*

КІСЛАВОДСК, бальнеа-кліматычны курорт з групы *Кайказскіх Мінеральных Водаў*, за 38 *км* ад Пяцігорска, 64 *км* ад чыг. ст. Мінеральныя Воды.

Клімат умерана кантынентальны. Сярэднегадавая т-ра 8,0 °С, сярэдні атм. ціск 690 *мм*, сярэдняя адносная вільготнасць 56—64%. Сонечна 2093 гадзіны ў год. Асн. лекавыя фактары: мінер. крыніцы (пітныя — даламітныя і сульфатныя нарзаны, на ванны — галоўны, асноўны нарзан) і дазаваная хадзьба (тэрэнкур). У К. (1970) 35 санаторыяў, 4 пансіянаты, кардыялагічная клініка імя Леніна, Галоўныя і Кастрычніцкія ванны, завод разліву нарзану. Лечаць ад хвароб органаў кровазвароту, стрававальна-кішачнага тракту і дыхальных шляхоў нетуберкулёзнага паходжання. Сезон увесь год.

Літ.: Смирнов-Каменский Е. А. Курорт Кисловодск, Ставрополь, 1962.

КІСЛАРОД (Oxygenium), O, хімічны элемент VI групы перыядычнай сістэмы Мендзялеева, ат. н. 8, ат. м. 15,9994. К. адкрылі незалежна швед. вучоны К. Шэеле (1769—70) і англ. вучоны Дж. Прыстлі (1774). К.— найбольш пашыраны на Зямлі элемент. Яго змест па масе ў вадзе 85,82%, у зямной кары 47,2%, у паветры 23,15%. К.— неабходная састаўная частка ўсіх жывых арганізмаў. У прыродзе трапляюцца 3 ізатопы К.: ^{16}O (99,76%), ^{17}O (0,04%), ^{18}O (0,20%). К.— газ без колеру і паху; пры ахалоджванні пераходзіць спачатку ў вадкасць сіняватага колеру, *t* кіп. −182,98 °С, потым у крышталі, *t* пл. −218,7 °С. Пры т-ры 1500 °С малекулы O_2 пачынаюць распадацца на атамы.

Існуе дзве алатрапічныя мадыфікацыі К.: звычайны К., які складаецца з малекул O_2, і нястойкі азон O_3. У хім. злучэннях 2-валентны. Добры акісляльнік. Уступае ў рэакцыі амаль з усімі элементамі, утвараючы вокіслы. Акісленне пры высокай т-ры можа суправаджацца гарэннем з-за выдзялення вял. колькасці цяпла. Гарэнне ў К. адбываецца намнога хутчэй, чым у паветры. Пры нізкай т-ры акісленне ідзе павольна, без гарэння. К. у прысутнасці вады выклікае карозію металаў. Павольнае акісленне рэчываў жывёльнага і раслінага паходжання паз. гніеннем. К. неабходны для дыхання чалавека і жывёл. Спад К. ў атмасферы за кошт акісляльных працэсаў кампенсуецца выдзяленнем К. раслінамі пры фотасінтэзе. У прамысловасці К. атрымліваюць звычайна звадкаваннем і рэктыфікацыяй паветра. Выкарыстоўваюць у тэхніцы для атрымання высокіх т-р, інтэнсіфікацыі металург. працэсаў, у медыцыне. Вадкі К. ужываецца як акісляльнік для рэакт. паліва, а таксама ў вырабе выбуховых рэчываў — акселіквітаў.

Літ.: Кислород. Справочник, ч. 1—2, М., 1967; Бродянский В. М. и Меерзон Ф. И. Производство кислорода, 2 изд., М., 1970; Гузман И. С. и Кострицкий В. Я. Кислородное машиностроение за рубежом, М., 1970; Кислородный режим организма и его регулирование. Материалы симпозиума, Киев, 1966. *В. В. Свірыдаў.* Мінск.

КІСЛАРОДНАЕ ГАЛАДАННЕ, паніжаная колькасць кіслароду ў тканках арганізма, тое, што *гіпаксія*.

КІСЛАРОДНАЯ РЭЗКА, спосаб змяніць форму і памеры металічных (пераважна стальных) вырабаў спальваннем металу ў месцы рэзкі ў струмені кіслароду. Пашырана ў машынабудаванні і буд-ве.



Ручны разак для кіслароднага рэзання металу: *1* — рэзальны наканечнік з мундштукамі; *2* — трубка для «рэзальнага» кіслароду; *3* — трубка для гаручай сумесі; *4* — змешвальная камера; *5* — корпус з рэгулявальнымі вентылямі; *6* — ніпель для кіслароду; *7* — ніпель для ацэтылену.

Заснавана на здольнасці большасці сталяў загарацца ў кіслародзе пры т-ры, ніжэйшай за т-ру плаўлення, што забяспечвае дакладнае і дастаткова чыстае рэзанне. К. р. робіцца разаком (гл. рыс.), да якога шлангамі падводзяцца кісларод, гаручы газ (ацэтылен, вадарод, прыродны газ) ці вадкае паліва (бензін, газа). Гаручы газ ці вадкае паліва, загараючы, падаграваюць паверхню металу перад струменем «рэзальнага» кіслароду. Пры рэзцы высакахромістай сталі, чыгуну і каляровых металаў у разрэз уводзяцца які-н. флюс для мясцовага павышэння т-ры, разбаўлення шлаку і мех. выдалення плёнкі вокіслаў.

Літ.: Гл. пры арт. *Газавая зварка.*

КІСЛАРОДНАЯ ТЭРАПІЯ (оксігенатэрапія), увядзенне кіслароду ў арганізм з лекавай мэтай.

Робяць пры *гіпаксіі, газавай гангрэне, аскарыдозе, трыхацэфалёзе, вачэй хваробах.* Кісларод уводзяць інгаляцыяй — удыханнем (кіслародныя падушкі, інгалятары), падскурна, унутрывенна, праз кішэчнік і інш. Пытанні К. т. пры комплексным лячэнні хвароб вачэй даследуюцца ў Мінскім мед. ін-це.

Літ.: Дембо А. Г. Недостаточность функции внешнего дыхания, Л., 1957 (бібліягр.); Бирич Т. В. Оксигенотерапия при некоторых заболеваниях глаз, у кн.: Сб. научных трудов Минского гос. мед. ин-та, т. 20, Мн., 1957; Архангельский В. Н. Глазные болезни, 2 изд., М., 1969.

Т. В. Бірыч. Мінск.

КІСЛІК Навум Зіноўевіч (н. 26.9.1925, Масква), рускі савецкі паэт. Сын рабочага. Удзельнік Айч. вайны. Скончыў БДУ (1950). Настаўнічаў, у 1952—58 супрацоўнік газ. «Літаратура і мастацтва». Друкуецца з 1944. Аўтар зб. «Размова з слябрамі» (1956), «Пошук» (1959), «Пазыўныя зямлі» (1961). Пераклі па рус. мову раман І. Мележа «Людзі на балоце», аповесці А. Карпюка «Данута» і «Пушчанская адысея», асобныя творы М. Аўрамчыка, П. Броўкі, А. Вялюгіна, А. Куляшова, П. Панчанкі, А. Пысіна, П. Труса, В. Таўлая і інш. Узнаг. ордэнам Айч. Вайны 2-й ступені, медалямі.

Тв.: Повесть о прессованном порохе, Мн., 1964; Ветви, Мн., 1969.

Літ.: Тарас В. Сяброўская размова, «Полымя», 1956, № 10; Бечык В. В мире прочных ценностей, «Неман», 1969, № 11. *В. Л. Бечык.* Мінск.

КІСЛІЦА (Oxalis), род адна- і шматгадовых травяністых раслін сям. кіслічных. Каля 800 відаў, пашыраных у Еўропе, Афрыцы і Амерыцы. У СССР 6 відаў, на Беларусі 2.



Кісліца звычайная.

Выш. раслін 8—30 см. Лісце трайчастае або пальчатаскладанае. Кветкі рознага колеру, адзіночныя ці ў парасонавых або гронкавых суквецціях. Плод — каробачка. На Беларусі найб. пашырана К. звычайная (O. acetosella, нар. назвы: квасок, зайчава капуста, баршчоўка) — шматгадовая расліна з тонкім карэнішчам і белымі кветкамі, якім уласціва *клейстагамія*. Расце ў лясах, на палях. Лісце ядомае (мае шчаўевую к-ту). К. ранковая, К. ружовая вырошчваюцца як дэкар. расліны (дывановыя клумбы, міксбордэры, бардзюры). К. Орттіса — вядомая пакаёвая і аранжарэйная расліна.

Літ.: Флора БССР, т. 3, Мн., 1950; Справочник цветовода, М., 1971.

КІСЛІЦЫН Аляксей Мікітавіч [14(27).5.1914, в. Ключы Кацельніцкага пав. Вяцкай губ.— 16.12.1949], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1942. У Чырв. Арміі з 1936. На фронце з 1941. Вызначыўся пры вызваленні Віцебшчыны. У чэрв. 1944 батальён пад камандаваннем К. ўдзельнічаў у прарыве абароны ворага і авалоданні ст. Сіроціна і г. п. Шуміліна. 25.6.1944 батальён фарсіраваў Зах. Дзвіну, захапіў плацдарм і вызваліў г. п. Бешанковічы.

КІСЛОТАТРЫВАЛЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ, канструкцыйныя і будаўнічыя матэрыялы, стойкія супраць разбуральнага дзеяння кіслот і інш. хім. агрэсіўных рэчываў (шчолачаў, газаў і да т. п.).

Падзяляюцца на металічныя і неметалічныя (неарган. і арган.). Металічныя К. м.— спец. гатункі сталі, чыгуну і каляровых сплаваў, легіраваныя хромам, нікелем, крэмніем, ніобіем, тытанам і інш.; найб. пашыраныя — хромістыя і хрома-нікелевыя сталі, крамністы чыгун (сілал), каляровыя сплавы — ніхромы (аснова нікель), алавяністыя, алюмініевыя і крамністыя бронзы, нікелева-медныя сплавы і інш. Неарган. К. м. бываюць натуральныя (граніт, андэзіт, бештаўніт, дыябаз, кварцыт) і штучныя (керамічныя, шкло, бетон, цэмент). Арган. К. м.— некаторыя пластмасы (вініпласт, пластыкат), гума, бітумы, кіслотастойкія лакі, замазкі і інш. Выкарыстоўваюцца К. м. ў хім., харч. прамысловасці, буд-ве і інш. Шмат тыпаў К. м. выпускаюць прадпрыемствы БССР.

Літ.: Химушин Ф. Ф. Нержавеющие стали, 2 изд., М., 1967; Неметаллические материалы в химическом машиностроении (под ред. Горяиновой А. В.), М., 1967 (Труды Всесоюзн. научно-исслед. и конструкторского ин-та химического машиностроения, в. 52).

КІСЛОТНАСЦЬ ГЛЕБЫ, уласцівасць глебы, абумоўленая наяўнасцю іонаў вадароду ў глебавым растворы, а таксама абменных іонаў вадароду і алюмінію ў *глебавым паглынальным комплексе*. Павышаная К. г. шкодна дзейнічае на развіццё раслін і многіх карысных глебавых мікраарганізмаў.

Адрозніваюць 2 формы К. г.: актыўную, або актуальную кіслотнасць (pH) глебавага раствору, глебавай суспензіі або водных выцяжкі з глебы; патэнцыяльную (абменную і гідралітычную) кіслотнасць цвёрдай фазы глебы. Найб. кіслыя глебы (pH 3,5—5,5) — падзолістыя, тарфяна-балотныя і чырваназемы. К. г. рэгулююць вапнаваннем кіслых, гіпсаваннем шчолачных глебаў, фізіялагічна кіслымі і шчолачнымі ўгнаеннямі (гл. *Вапнаванне глебы* і *Гіпсаванне глебы*). Гл. таксама *Аграхімічныя картаграмы*.

Літ.: Чернов В. А. О природе почвенной кислотности, М.— Л., 1947.

КІСЛОТЫ, клас хім. злучэнняў, якія змяшчаюць вадарод, здольны пры дысацыяцыі ў водных растворах адшчапляцца ў выглядзе іона. Пры замяшчэнні вадароду на іон металу ўтвараюцца солі.

У залежнасці ад колькасці іонаў вадароду, якія адшчапляюцца ад малекул, К. падзяляюцца на адна-асноўныя (азотная HNO_3, салянай HCl), двух-асноўныя (серная H_2SO_4, вугальная H_2CO_3) і г. д. Паводле ступені дысацыяцыі адрозніваюць моцныя К. (напр., азотная, серная, якія ў разбаўленых водных растворах дысацыіруюць амаль цалкам) і слабыя (вугальная, воцатная; дысацыіруюць нязначна). Для класіфікацыі кіслот і асноў у няводных растворах карыстаюцца пераважна дзвюма тэорыямі. Пратонная тэорыя Брэнстэда (1923) лічыць К. рэчывы, якія адшчапляюць пратоны. Паводле тэорыі Льюіса (1923), К.— акцэптары электронай пары, напр. $SnCl_4$, BF_3 (а асновы — донары электронай пары). Кіслотныя ўласцівасці рэчываў паводле першай тэорыі звязваюцца з наяўнасцю пратона, паводле другой — абумоўліваюцца будовай часцінак, якая вызначае іх электронна-акцэптарныя ўласцівасці. Унутраная сувязь паміж тэорыямі заключаецца ў тым, што і пратон і К. паводле Льюіса маюць вялікую роднасць да электронай пары. Многія К. шырока ўжываюцца ў нар. гаспадарцы (гл. *Азотная кіслата, Серная кіслата, Саляная кіслата, Воцатная кіслата, Карбонавыя кіслоты*).

Літ.: Усанович М. И. Исследования в области теории растворов и теории кислот и оснований. Избр. труды, Алма-Ата, 1970; Некрасов Б. В. Основы общей химии, 2 изд., т. 1, М., 1969; Шатенштейн А. И. Теории кислот и оснований, М.— Л., 1949. *В. В. Свірыдаў.* Мінск.

КІСЛОЎ Пётр Міхайлавіч [29.12.1905 (11.1.1906), Каломна Маскоўскай губ.— 16.12.1968], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1925. На фронце з 1942, нам. камандзіра батальёна па палітчастцы. Вызначыўся ў Гомельскай вобл. У кастр. 1943 з групай байцоў пад агнём праціўніка пераправіўся цераз Дняпро каля Лоева, уварваўся ў варожыя траншэі, захапіў плацдарм. Паранены не пакінуў поля бою.

КІСЛЫЯ ГОРНЫЯ ПАРОДЫ, пароды, якія змяшчаюць больш як 65% крамнекіслаты SiO_2, лішак якой выдзяляецца ў выглядзе кварцу ці аморфнага крамнязёму.

К. г. п.— граніты, гранадыярыты, граніт-парфіры, аплiты, ліпарыты, дацыты, абсідыяны. З К. г. п. звязаны радовішчы волава, вальфраму, золата, поліметалаў і інш. Выкарыстоўваюцца як буд. і аблiцовачныя камяні. Пашыраны ў крышт. фундаменце БССР.

КІСЛЯК Мікалай Аляксандравіч [н. 9 (22).10.1916, Тамбоў], Герой Сав. Саюза (1945). Беларус. З рабочых. Чл. КПСС з 1941. У Чырв. Арміі з 1939. У Айч. вайну на фронце з 1941— штурман знішчальнага авіяпалка Чарнаморскага флоту. Удзельнік абароны і вызвалення Крыма, вызвалення Таманскага п-ва, Малдавіі, аховы баявых караблёў на Чорным м. Зрабіў 302 вылеты, правёў 50 паветр. баёў, збіў 12 самалётаў. З 1958 у адстаўцы. Жыве ў Севастопалі.



КІСТА (грэч. kýstis пузыр), паталагічная поласць у органах і тканках арганізма з вадкім або кашападобным змесцівам. Лячэнне хірургічнае.

КІСТАЎ Аляксандр Фёдаравіч [25.8 (7.9).1903, Царыцын — 14.5.1960], рускі савецкі акцёр. Нар. арт. БССР (1953). Чл. КПСС з 1931. Скончыў Ленінградскі тэатр. тэхнікум (1928, педагог Л. Віўен). Працаваў у т-рах Ленінграда, Куйбышава, Масквы. З 1944 у Дзярж. рус. т-ры БССР імя М. Горкага. Валодаў моцным трагедыйным тэмпераментам. Глыбокі псіхалагізм, грамадз. пафас, яснасць замыслу спалучаліся ў творчасці К. з багатай гукавой і пластычнай тэхнікай. Поўна і ярка паказваў чалавечыя пачуцці, звычайна пазбягаў паўтонаў. Вяршыня творчасці — роля караля Ліра ў аднайм. п'есе У. Шэкспіра. З інш. роляў: Атэла, сэр Тобі («Атэла», «Дванаццатая ноч» Шэкспіра), Шуйскі («Цар Фёдар Іаанавіч» А. К. Талстога), Радазубаў («Варвары» М. Горкага), Прыбыткоў («Апошняя ахвяра» А. Астроўскага), Ванюшын («Дзеці Ванюшына» С. Найдзёнава), Барэйка («Порт-Артур» паводле А. Сцяпанава), Важак («Аптымістычная трагедыя» У. Вішнеўскага), Варапаеў («Шчасце» паводле П. Паўленкі), Ермашоў («Брэсцкая крэпасць»







А. Ф. Кістаў у ролях Важака (злева) і караля Ліра.

К. Губарэвіча). Здымаўся ў кіно («Наперадзе — круты паварот», «Першыя выпрабаванні» і інш.). Узнаг. ордэнам Леніна.

Літ.: Няфёд У. Аляксандр Фёдаравіч Кістаў, у зб.: Мастацтва Савецкай Беларусі, Мн., 1955; Бурьян Б. и Лисневский И. На высоком взлете, Мн., 1962. *В. І. Бур'ян.* Мінск.

КІСЦЯНІ, вёска ў Рагачоўскім р-не Гомельскай вобл., на правым беразе Дняпра. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Кісцяні». За 19 *км* па ПнУ ад Рагачова, 140 *км* ад Гомеля. 826 ж., двароў 237 (1971). Малочны з-д, цагельня, камбінат быт. абслугоўвання, рамонтныя майстэрні. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, аддз. сувязі, сталовая, 2 магазіны. У жн. 1941 вёску часткова спалілі нямецка-фашысцкія захопнікі. Помнік на брацкай магіле 268 сав. воінаў Айч. вайны. На правым беразе Дняпра гарадзішча мілаградскай і зарубінецкай культур, побач паселішча позняга этапа зарубінецкай культуры.

КІСЯЛЁЎСКІ Леанід Іванавіч (н. 12.4.1927, Мінск), беларускі савецкі фізік. Чл.-кар. АН БССР (1972), праф. (1971), д-р фіз.-матэм. н. (1970). З рабочых. Чл. КПСС з 1963. Скончыў БДУ (1952). У 1955—59 выкладчык Мінскага пед. ін-та. З 1959 у Ін-це фізікі АН БССР, пам. дырэктара (з 1970), адначасова заг. лабараторыі спектраскапіі нізкатэмпературнай плазмы (з 1968). Асн. навук. працы па фізіцы плазмы. Распрацаваў метады атрымання высокастабільнай нізкатэмпературнай плазмы, развіў спектраскапічныя метады яе дыягностыкі. Стварыў шэраг арыгінальных малагабарытных спектральных прылад для кантролю рэжымаў работы плазмавых установак.



Тв.: (Разам з В. А. Бондарам і У. Дз. Шымановіч) Спектроскопические и теплофизические исследования осесимметричной плазмы с температурой в максимуме до 100 000 °К, у кн.: «Теплофизические свойства жидкостей и газов при высоких температурах и плазмы, т. 2, М., 1969; (разам з У. А. Марозавым) О роли лучистых потоков в разрушении металлов высокоскоростными импульсными струями, «Журнал прикладной спектроскопии», 1970, т. 12, в. 3.

КІСЯЛЁВА Фядосся Фёдараўна [н. 25.2 (10.3).1914, в. Валосавічы Бабруйскага пав. Мінскай губ.], перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1958). У 1931—50 калгасніца, у 1950—69 даярка калгаса «Рассвет» імя Арлоўскага Кіраўскага р-на Магілёўскай вобл. Жыве ў в. Валосавічы.

КІСЯЛЁВА БУДА, вёска ў Клімавіцкім р-не Магілёўскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Рабочы». За 25 *км* на ПнУ ад Клімавіч, 136 *км* ад Магілёва, 2 *км* ад чыг. ст. Шасцёраўка, каля аўтамаб. дарогі Крычаў — Рослаўль (РСФСР; 1 *км*). 250 ж., гасп. 80 (1971). Лесапільня. Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. У вер. 1943 вёску спалілі нямецка-фашысцкія захопнікі. Помнік 151 земляку, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

КІСЯЛЁЎ Генадзь Васілевіч (н. 19.3.1931, г. Каломна Маскоўскай вобл.), беларускі савецкі гісторык і літаратуразнавец. Канд. гістар. н. (1964). З сям'і служачага. Скончыў Маскоўскі гісторыка-архіўны ін-т (1953). У 1960—72 працаваў у архіўных установах Вільнюса, з 1972 у Ін-це л-ры АН БССР. Адзін са складальнікаў зб. дакументаў «Рэвалюцыйны пад'ём у Літве і Беларусі 1861—1862 гг.» (1964), «Паўстанне ў Літве і Беларусі 1863—1864 гг.» (1965). Вывучае грамадска-паліт. і літ. жыццё Беларусі 19 ст. Даследуе дзейнасць і творчасць К. Каліноўскага, А. Трусава, В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, А. Вярыгі-Дарэўскага і інш.

Тв.: Сейбіты вечнага, Мн., 1963; К характеристике революционного мировоззрения К. С. Калиновского, у кн.: Славянское источниковедение, М., 1965; З думай пра Беларусь, Мн., 1966; Загадка беларускай «Энеіды», Мн., 1971.

В. П. Рагойша. Мінск.

КІСЯЛЁЎ Кузьма Венядзіктавіч [н. 19.10 (1.11).1903, в. Лабковічы Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ.], дзярж. дзеяч БССР. Канд. мед. н. (1936). З сялян. Чл. КПСС з 1925. Скончыў мед. ф-т Варонежскага ун-та (1928). У 1928—37 ардынатар клінікі ун-та і нам. заг. акр. аддзела аховы здароўя ў Варонежы; навук. супрацоўнік Усесаюзнага ін-та эксперым. медыцыны. З 1937 нарком аховы здароўя БССР. У 1938—40 старшыня СНК БССР. З 1940 нам. дырэктара ін-та эксперым. медыцыны, дырэктар дзярж. мед. выдавецтва ў Маскве, старшыня Ульянаўскага аблвыканкома. З снеж. 1943 першы нам. старшыні СНК БССР. З сак. 1944 нам. старшыні СНК (з 1946 Савета Міністраў) БССР (да 1958) і нарком (з 1946 міністр) замежных спраў БССР. З 1966 саветнік Савета Міністраў БССР. На XVII—XXII, XXIV—XXV з'ездах КПБ выбраны чл.



ЦК, чл. Бюро ЦК КП(б)Б (1938—40, 1947—49). Дэп. Вярх. Савета СССР 1—4-га скл., Вярх. Савета БССР 1—6-га скл. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, 3 інш. ордэнамі, медалямі.

КІСЯЛЁЎ Мацвей Сямёнавіч (18.11.1896, мяст. Крычаў Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ.— 1942), герой грамадз. вайны, першы кавалер 2 ордэнаў Чырв. Сцяга (1919, 1920). З сялян. Чл. КПСС з ліст. 1917. Скончыў курсы пры Ваен. акадэміі імя Фрунзе (1926). Змагаўся за Сав. ўладу ў Крычаве і Чэрыкаўскім пав. Магілёўскай губ. З 1918 у Варонежскім губ. ваенкамаце. У сак. 1919 камандаваў разгромам контррэвалюц. паўстання ў Зямлянскім пав. Варонежскай губ. У вер.— кастр. 1919 нач. штаба ўдарнай групы войск па барацьбе з белагвардз. корпусам Мамантава, удзельнік абароны Варонежа. З крас. 1920 у Кіеве — ваенком інж. ўпраўлення, камандзір брыгады асобага прызначэння, камендант г. Кіева, нач. стралк. корпуса. З 1926 у Маскве, працаваў у міліцыі і ў буд. арг-цыях. Імем К. названа вул. ў Крычаве. *М. Ф. Мельнікаў.* Крычаў.



КІСЯЛЁЎ Пётр Аляксандравіч [н. 2(15).7. 1912, г. Таганрог], савецкі гідрагеолаг. Д-р геолага-мінералагічных навук (1961). Скончыў Маскоўскі геолагаразведачны ін-т (1935). У 1946—70 у Бел. н.-д. геолагаразведачным ін-це. Вывучаў гідрагеал. ўмовы Беларусі, у прыватнасці Палесся, і інш. раёнаў СССР. Працы па рэжыме, балансе і дынаміцы падземных водаў. Прэмія АН СССР імя Саварэнскага (1965). З 1970 у Усесаюзным НДІ гідрагеалогіі і інжынернай геалогіі (Масква).

Тв.: Исследование баланса грунтовых вод по колебаниям их уровня, Мн., 1961; Исследование закономерностей режима грунтовых вод в районе Полесской низменности на основе гидродинамического анализа, у кн.: Режим и баланс подземных вод, Мн., 1964; Количественная оценка питания напорных подземных вод на территории БССР по данным гидродинамического анализа их естественного режима, у кн.: Режим, баланс и регионика подземных вод, Мн., 1969.

КІСЯЛЁЎ Рыгор Якаўлевіч [5(18).5.1913, в. Мікалаеўка Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ.— 10.4.1970], дзярж. дзеяч БССР. Канд. гістар. н. (1951). Засл. дзеяч культ. БССР (1963). З сялян. Чл. КПСС з 1941. Скончыў Гомельскі пед. ін-т (1947), Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК ВКП(б) (1951). У 1932—36, 1938—39 на пед. рабоце ў школах Буда-Кашалёўскага і Касцюковіцкага р-наў. У 1939—42 у Чырв. Арміі. З 1942 заг. аддзела і сакратар Петухоўскага РК ВКП(б) Курганскай вобл. У 1945—46 сакратар райкома, нам. заг. аддзела кадраў Гомельскага абкома КП(б)Б. З 1947 у ЦК КП(б)Б: заг. аддзела, нам. нач. ўпраўлення кадраў, заг. аддзела навукі і ВНУ. З 1953 міністр культуры, з 1964 міністр асветы БССР, з мая 1968 нам. старшыні Савета Міністраў БССР. На XX—XXII, XXIV—XXVI з'ездах КПБ выбраны чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета БССР 3—7-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі.

КІСЯЛЁЎ Ціхан Якаўлевіч [н. 30.7(12.8). 1917, в. Агародня Кузьмініцкая Гомельскага пав. Магілёўскай губ.], савецкі парт. і дзярж. дзеяч, старшыня Савета Міністраў БССР. З сялян. Чл. КПСС з 1940. Скончыў Гомельскі пед. ін-т (1941), ВПШ пры ЦК ВКП(б) (1946). З 1936 на пед. працы ў школах Ельскага р-на Гомельскай вобл. У 1941—44 выкладчык, дырэктар школы ў Сталінградскай вобл. З 1944 інструктар Гомельскага абкома, з 1946 кіраўнік лектарскай групы Брэсцкага абкома КП(б)Б. З 1948 у апараце ЦК КП(б)Б: заг. аддзела школ упраўлення прапаганды і агітацыі, нам. загадчыка, заг. аддзела прапаганды і агітацыі. З 1952 першы сакратар Брэсцкага абкома КПБ. З ліп. 1955 сакратар, з ліп. 1956 другі сакратар ЦК КПБ. На пленумах ЦК КПБ у 1957—59 выступіў з дакладамі па актуальных пытаннях парт. буд-ва: пра выхаваўчую работу сярод моладзі, работу калгасных парт. арг-цый, пра работу з кадрамі і інш. У крас. 1959 на 1-й сесіі Вярх. Савета БССР 5-га скл. назначаны старшынёй Савета Міністраў БССР. На пасадзе кіраўніка ўрада рэспублікі К. свой вопыт і здольнасці накіроўвае на практ. ажыццяўленне чарговых паліт. і нар.-гасп. задач. На XXVI—XXVII з'ездах КПБ, пленумах ЦК, 1, 6, 8-й сесіях Вярх. Савета БССР 6-га скл., 2-й сесіі 8-га скл. выступіў з дакладамі па важных пытаннях дзярж. буд-ва: пра пяцігадовыя планы развіцця нар. гасп. (1960, 1964, 1971), паляпшэнне бытавога абслугоўвання нас. рэсп. (1963), паляпшэнне кіравання прамысловасцю (1965), пра ход капітальнага буд-ва і вытворчасць буд. матэрыялаў (1966) і інш. У чэрв. 1967 узначальваў дэлегацыю БССР на V Надзвычайнай спец. сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. На XXII—XXIV з'ездах КПСС выбраны чл. ЦК. На XX—XXII, XXIV—XXVII з'ездах КПБ выбраны чл. ЦК, з ліп. 1955 чл. Бюро ЦК КПБ. Дэпутат Вярх. Савета СССР 4—8-га скл., нам. старшыні Савета Нацыянальнасцей Вярх. Савета СССР 5-га скл. Дэп. Вярх. Савета БССР 3—8-га скл. Узнаг. 3 ордэнамі Леніна, інш. ордэнамі, медалямі.



Тв.: У братняй сям'і народаў СССР, Мн., 1968; О состоянии и мерах по дальнейшему улучшению жилищного и культурно-бытового строительства на селе, у кн.: Материалы республиканского совещания по сельскому строительству, Мн., 1967; Аб праекце дырэктыў XXIV з'езду КПСС па пяцігадоваму плану развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1971—1975 гады, у кн.: Матэрыялы XXVII з'езду Камуністычнай партыі Беларусі, Мн., 1971; На основе ленинской национальной политики, «Партийная жизнь», 1957, № 18; 40 лет Коммунистической партии Белоруссии, там жа, 1958, № 23; Всемерно улучшать воспитательную работу среди молодежи, «Коммунист Белоруссии», 1958, № 1; Советская Белоруссия в общесоюзном разделении труда, «Экономическая газета», 1961, 28 авг., № 4; Мелиорация в Белоруссии, там жа, 1966, № 2; Выканаць волю народаў!, «Звязда», 1967, 27 чэрв., № 148; Залог грядущих побед, «Коммунист Белоруссии», 1967, № 12; Аб праекце новага Прыкладнага Статута калгаса (сельгасарцелі), «Звязда», [illegible] ліст., № 265; Задачы мясцовых Саветаў Бе[illegible]ССР па выкананню рашэнняў XXIV з'езду КПСС, [illegible]ка, 1971, 25 жн., № 196; Аб дзяржаўным пяцігадовым плане развіцця народнай гаспадаркі Беларускай ССР на 1971 — 1975 гады і аб дзяржаўным плане развіцця народнай гаспадаркі Беларускай ССР на 1972 год, там жа, 1971, 17 снеж., № 293; Магутная сіла брацкай дружбы, там жа, 1972, 19 сак., № 66.

КІСЯЛЁЎСК, горад абл. падпарадкавання ў Кемераўскай вобл. РСФСР. Размешчаны ў перадгор'ях Салаірскага кража. Узнік на месцы трох вёсак, горад з 1936. Чыг. станцыя. 126 тыс. ж. (1971). Важны цэнтр здабычы вугалю і машынабудавання (вытворчасць шахтавага абсталявання), вуглеабагачальныя ф-кі. Абутковая ф-ка, вытворчасць мэблі. Прадпрыемствы буд. матэрыялаў. Станцыя падземнай газіфікацыі вугалю. Горны і маш.-буд. тэхнікумы, пед. вучылішча.

КІСЯЛЁЎЦЫ, вёска ў Кобрынскім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета. За 8 *км* на ПдУ ад Кобрына, 60 *км* ад Брэста, 13 *км* ад чыг. ст. Кобрын, на аўтамаб. дарозе Кобрын — в. Дзівін. 443 ж., гасп. 134 (1971). Васьмігадовая школа, б-ка, бальніца, аптэка, вет. пункт, аддз. сувязі, магазін.

КІСЯЛІ-ДЫМАКУРЫ, гарадзішча *штрыхаванай керамікі культуры, днепра-дзвінскай культуры* (4—3 ст. да н. э.— 4 ст. н. э.), тыпу верхняга пласта *Банцараўшчыны* (5—8 ст.) і раннефеадальнага часу (9—12 ст.), каля в. Кісялі Талачынскага р-на Віцебскай вобл., на беразе р. Сакалянкі. Умацавана валамі і равамі. Адкрыта ў 1873, даследавалася Л. А. Міхайлоўскім (1950) і Л. В. Аляксеевым. Пры раскопках знойдзены ляпная штрыхаваная, гладкасценная і кружальная кераміка, бронзавы наканечнік стралы познаскіфскага часу, шыфернае прасліца, косці дзікіх і свойскіх жывёл.

Літ.: Алексеев Л. В. Полоцкая земля, М., 1966.

КІСЯЛЬКІ, вёска ў Сухарэўскім с/с Магілёўскага р-на. Цэнтр калгаса «Камунар». За 20 *км* на ПнУ ад Магілёва, 21 *км* ад чыг. ст. Лупалава, каля аўтамаб. дарогі Магілёў — в. Расна (0,7 *км*). 153 ж., двароў 56 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, магазін. У чэрв. 1944 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі.

КІТ (лац. Cetus), экватарыяльнае сузор'е. У ім знаходзіцца першая вядомая пераменная зорка *Міра*, змену бляску якой выявіў (1596) ням. астраном Д. Фабрыцыус. На тэр. БССР К. добра відаць увосень. Гл. *Зорнае неба.*

КІТА (Quito), горад, сталіца Эквадора, адм. ц. правінцыі Пічынча. Размешчаны на схілах вулкана Пічынча, на выш. 2850 *м* над узр. м. Чыгункай злучаны з гал. прамысл. гарадамі краіны, а Панамерыканскай шашой з гарадамі краіны, Перу і Калумбіяй. Міжнар. аэрапорт. 512 тыс. ж. (1970). Цэнтр тэкст. прамысловасці. Хім., харч., дрэваапр., цэментавая, мукамольная прамысловасць. Гарбарна-абутковыя, фармацэўтычныя прадпрыемствы. Вытворчасць керамікі, залатых і сярэбраных вырабаў.

Засн. 6.12.1534 на месцы стараж. індзейскага горада. У перыяд ісп. панавання — цэнтр калоніі (т. зв. вобл. Кіта). У 1592, 1765, 1809 тут адбыліся паўстанні супраць ісп. прыгнёту. У 1822—30 у складзе Вялікай Калумбіі. З 1830 сталіца Эквадора. Горад захаваў аблічча калан. часоў (вузкія вулічкі, саманавыя дамы з разьбянымі драўлянымі галерэямі і ўнутр. дворыкамі). Прамавугольная планіроўка К. збераглася ад 16 ст. На пл. Індэпендэнсія будынкі колішніх палацаў віцэ-караля, архіепіскапа, ратуша, сабор. Найб. значныя помнікі: манастыр Сан-Франсіска і манастырская ц. з фасадам у стылі Адраджэння, ц. манастыра Сан-Аўгусцін з гатычнымі перакрыццямі; манастыр Мерсед; п. Ла Кампанія (усе 16 ст.). Сярод будынкаў 19—20 ст.— Ваен. школа, астр. абсерваторыя, школа прыгожых мастацтваў, т-р Сукрэ. 2 ун-ты, Акадэмія навук, 4 б-кі, 5 музеяў.

КІТА́БЫ (араб.), разнастайныя рэлігійныя кнігі, напісаныя на бел. мове арабскім пісьмом. Ствараліся татарамі, якія пасяляліся на Беларусі з 14 ст.

Апынуўшыся ў бел. асяроддзі, татары паступова забылі родную мову і свае рэліг. кнігі пачалі пісаць на бел. мове, але па традыцыі ўжывалі араб. пісьмо. У вузкім сэнсе К.— рукапісныя зборнікі, якія змяшчаюць паданні пра жыццё і дзейнасць Мухамеда і яго паплечнікаў, біблейскія легенды, апісанні абрадаў, рытуалаў і абавязкаў мусульман, маральна-павучальныя апавяданні і прыгодніцкія аповесці. Да гэтага роду татарскай пісьменнасці адносяцца таксама хамаілы — дапаможнікі для служак рэліг. культу, дзе араб. ці цюрк. тэксты суправаджаюцца тлумачэннямі на бел. ці польск. мовах, і тэфсіры — тэксты карана на араб. мове з падрадковым перакладам на бел. мову. Такія помнікі пачалі ствараца каля сярэдзіны 16 ст., але зберагліся ў спісах 17—20 ст. Вядома каля 30 К., якія зберагаюцца ў Гісторыка-этнагр. музеі АН Літ. ССР (7), б-ках Ленінградскага (4), Вільнюскага (2) ун-таў, фондзе рукапісаў Казанскага ун-та (2), б-цы АН БССР (2) і інш., а таксама ў прыватных асоб. Даследавалі К. ў розны час, пачынаючы з 19 ст., рус., бел., польск. вучоныя А. Мухлінскі, Я. Станкевіч, І. Крачкоўскі, А. Самойлавіч, В. Вольскі, А. Заянчкоўскі, М. Канапацкі, А. Варановіч і інш. Склад. змест, графіку і арфаграфію К. найбольш поўна вывучаў дац. Вільнюскага ун-та А. Антановіч. Некат. К. шырока адлюстроўваюць дыялектныя асаблівасці бел. мовы.

Літ.: Антонович А. К. Белорусские тексты, писанные арабским письмом, и их графико-орфографическая система, Вильнюс, 1968.

А. І. Жураўскі. Мінск.

КІТА́ЕЎ Мікалай Іванавіч [н. 10(23).12.1906, г. Сярдобск Саратаўскай губ.], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Магілёўскай вобл. ў Айч. вайну. З рабочых. Чл. КПСС з 1929. Скончыў Ваен.-паліт. акадэмію імя Леніна (1940). З 1931 у Чырв. Арміі. З чэрв. 1941 на фронце. У вер. 1941 — жн. 1942 на падпольнай рабоце ў Смаленскай вобл. У партызанах з жн. 1942 — камандзір атрада, батальёна; з жн. 1943 камандзір *партызанскай брыгады № 17* Магілёўскай вобл. З кастр. 1943 да сак. 1944 у распараджэнні БШПР, потым на фронце. Пасля вайны ў Сав. Арміі. Узнаг. 4 ордэнамі, медалямі. Жыве ў Сярдобску.

КІТА́Й, Кітайская Народная Рэспубліка, КНР (кіт. Чжун хуа жэньмінь гунхэго), дзяржава ў Цэнтр. і Усх. Азіі. На У абмываецца Жоўтым, Усходне-Кітайскім і Паўд.-Кітайскім морамі Ціхага ак. Пл. 9,6 млн. *км*² (3-е месца ў свеце). Нас. больш за 750 млн. чал. (1-е месца ў свеце, 1971, ацэн-



ка). Сталіца Пекін. К. падзяляецца на 22 правінцыі (разам з Тайванем, які знаходзіцца часова пад уладай гамінданаўцаў), 5 аўтаномных раёнаў і 3 гарады цэнтр. падпарадкавання (гл. табл. 1 і адпаведныя арт. аб правінцыях і аўтаномных раёнах). [На ўклейках: іл. да раздзелаў Прырода (I), Нар. гасп. (I, II), Гістар. нарыс (II), Архітэктура (III), Выяўл. маст. (IV)].

Табліца 1

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Кітая

Правінцыі, аўтаномныя раёны, гарады цэнтральнага падпарадкавання	Плошча, тыс. км²	Насельніцтва (1967—68, ацэнка), млн. чал.	Адміністрацыйны цэнтр
Правінцыі			
Аньхой	140	30	Хэфэй
Ганьсу	366	13	Ланьчжоў
Гірын	187	17	Чанчунь
Гуандун	231	40	Гуанчжоў
Гуйчжоў	174	17	Гуян
Ляанін	151	28	Шэньян
Сычуань	569	70	Чэнду
Фуцзянь	123	17	Фучжоў
Хубэй	188	32	Ухань
Хунань	210	37	Чанша
Хэбэй	203	43*	Цяньцзінь
Хэйлунцзян	464	21	Харбін
Хэнань	167	50	Чжэнчжоў
Цзянсі	165	22	Наньчан
Цзянсу	102	51	Нанкін
Цынхай	721	2	Сінін
Чжэцзян	102	31	Ханчжоў
Шаньдун	153	57	Цзінань
Шаньсі	157	18	Таюань
Шэньсі	196	21	Сіянь
Юньнань	436	20	Куньмін
Тайвань	36	13,8 (1969)	Тайбэй
Аўтаномныя раёны			
Гуансі-Чжуанскі	220	23	Наньнін
Нінся-Хуэйскі	66	2	Іньчуань
Сіньцзян-Уйгурскі	1647	8	Урумчы
Тыбецкі	1222	1,3	Лхаса
Унутраная Манголія	1178	13	Хух-Хота
Гарады цэнтральнага падпарадкавання			
Пекін	7	7	
Шанхай	6	10	—
Цяньцзінь	—	4	—

* Без Пекіна і Цяньцзіня.

Дзяржаўны лад. Паводле канстытуцыі 1954 КНР — дзяржава народнай дэмакратыі. Вышэйшы орган дзярж. улады — Усекітайскі сход нар. прадстаўнікоў (УСНП), які выбіраецца на 4 гады. Пастаянны дзейны орган УСНП — Пастаянны камітэт УСНП. Вышэйшы адм. орган КНР — Дзяржаўны савет на чале з прэм'ерам. Мясцовыя органы дзярж. улады — сходы нар. прадстаўнікоў. З пачатку «культурнай рэвалюцыі» не функцыянуе УСНП, выбраны ў 1964. Мясцовыя сходы нар. прадстаўнікоў не працуюць з 1968 і заменены т. зв. «рэвалюцыйнымі камітэтамі», якія ажыццяўляюць адм., выканаўчую і суд. ўладу.

Прырода. Рэльеф на большай частцы тэр. Кітая горны. Нізкагор'і і сярэднягор'і (Наньлін, Уішань, Дабешань, Малы Хінган і інш.) выш. 1000—2000 м акаймоўваюць Вялікую Кітайскую раўніну і раўніны Паўн. Усходу і Паўд. Усходу. На З ад раўнін хрыбты Вял. Хінган, Цыньлін (Тайбайшань, 4107 м), Юньнань-Гуйчжоўскае нагор'е, Лёсавае плато. На ПдЗ К. нагор'е Тыбет (выш. 4000—5000 м). На ўскраінах нагор'я распасціраюцца вял. горныя сістэмы з выш. 7000—8000 м і больш: Гімалаі (г. Джамалунгма, 8848 м, на граніцы з Непалам), Каракарум, Куньлунь, Наньшань і інш. На ПнЗ паміж Куньлунем і Цянь-Шанем Кашгарская ўпадзіна з пустыняй Такла-Макан, паміж Цянь-Шанем і Мангольскім Алтаем Джунгарская ўпадзіна. Асн. геал. структурныя адзінкі тэрыторыі К.— Кітайска-Карэйская і Паўднёва-Кітайская платформы, абмежаваныя на ПнЗ, Пн і ПнУ палеазойскімі складкавымі структурамі; на ПдЗ, Пд і У — мезазойскімі складкавымі структурамі. У межах Кітайска-Карэйскай платформы вылучаюць некалькі шчытоў і масіваў з дыслакаваных крышталь. парод, паміж якімі развіты адклады верхняга пратэразою, палеазою, мезазою і месцамі кайназою. На Паўд.-Кітайскай платформе разрэз асадкавых парод больш магутны і поўны. У канцы юры — пачатку мелу (іеншанская складкавасць) асадкавы чахол платформаў быў значна дыслакаваны, раздроблены шматлікімі тэктанічнымі разрывамі і перарваны інтрузіямі гранітоіднага саставу. К. багаты на карысныя выкапні. Вял. радовішчы кам. вугалю (на ПнУ — правінцыі Ляанін, Хэйлунцзян; у цэнтр. і ўсх. частках — правінцыі Аньхой, Хэбэй, Шаньсі; на ПнУ Сіньцзян — Уйгурскага аўт. раёна); нафты (правінцыя Ганьсу, Джунгарская, Цайдамская, Сычуаньская ўпадзіна), жал. рудаў (правінцыі Ляанін і Хубэй, Унутр. Манголія). У межах Паўд.-Кітайскай платформы радовішчы каляровых і рэдкіх металаў: вальфраму (правінцыя Цзянсі), волава, сурмы, магнезіту, ртуці, малібдэну, свінцу, цынку, медзі і інш. У Вял. Хінгане, Мангольскім Алтаі, Цянь-Шані, Куньлуні радовішчы золата. Вял. тэрыторыя, высокія горныя хрыбты і нагор'і, уплыў Ціхага ак. абумовілі разнастайнасць клімату (гл. табл. 2). Усх. раёнам характэрны мусонны клімат. На Пн і ПнУ ад хр. Цыньлін рэзкія ваганні т-ры паветра паміж зімою і летам, зіма звычайна суровая, на Пд — мяккая, лета гарачае і вільготнае. У зах. К. рэзка кантынентальны сухі клімат, на большай ч. паўн.-зах. Тыбета клімат суровы, высакагорны.

Табліца 2

Асноўныя кліматычныя паказчыкі Кітая

Пункт назірання	Вышыня станцыі над узр. м., м	Сярэднія месячныя т-ры, °С		Ападкаў за год, мм
		студзень	чэрвень	
Харбін	150	—20	23	607
Пекін	38	—4	27	603
Ухань	26	4	29	1238
Тайбэй	9	15	28	2117
Гуанчжоў	28	14	27	1619
Урумчы	905	—15	24	244
Лхаса	3600	0	17	497

На У і ПнУ рачная сетка густая. Найб. значныя рэкі: Янцзы, Хуанхэ, Сіцзян, Ляахэ, Сунгары, пагранічныя Амур і Усуры. На тэр. К. пачынаюцца Меконг, Салуін, Брахмапутра. Рэкі на У мнагаводныя, суднаходныя. Найб. высокі ўзровень вады летам. На Пн ад хр. Цыньлін зімой замярзаюць. На З рэк мала, малаводныя. Выкарыстоўваюцца на арашэнне. Найбольшыя: Тарым, Жашуй (Эдзін-Гол). У К. шмат каналаў, найважнейшы Вялікі канал. Многа азёраў. Падзяляюцца на тэктанічныя (Кукунор) у гарах і нагор'ях, воднаэразійныя і воднаакумуляцыйныя (Дунтынху, Паянху, Лабнор) на раўнінах Усх. Кітая. Глебавае покрыва разнастайнае: на У К. ў гарах ПнУ глебы бурыя лясныя і дзярнова-падзолістыя і на раўніне Сунляо чарназёмы і чарназёмападобныя, на Вял. Кітайскай раўніне алювіяльныя і карычневыя, на Пд жаўтазёмы і чырваназёмы. Асабліва ўрадлівыя чырваназёмы Сычуаньскай упадзіны і на Пд ад Янцзы. Ва ўнутр. раёнах каштанавыя, бурыя, шэра-бурыя глебы, глебы высакагорных стэпаў і пустыняў (Тыбет). Расліннасць багатая на віды. Шмат рэліктаў стараж. флоры (гінка і інш.). Каштоўныя пароды дрэў: ціс, тунг, гевея, лакавае, камфоравае. Лясістасць каля 5%. Лясныя масівы захаваліся на ПнУ (тайга, кедрава-шыракалістыя і шыракалістыя лясы), на Пд і ПдУ (субтрапічныя і трапічныя лясы). У цэнтр. частцы і на У Кітая глебы пад пасевамі с.-г. культур. На ПнЗ пераважна пустынная і паўпустынная расліннасць (пустыні Такла-Макан, Алашань, Гобі). У Цянь-Шані і ва ўсх. Наньшані збераглiся астравы хвойных лясоў. У Тыбеце нізкая травяністая расліннасць з тыбецкай асакі. Жывёльны свет багаты на віды.

Насельніцтва. У К. жыве больш як 50 розных нацыянальнасцей і этн. груп. Пераважаюць кітайцы (ханьцы) — 94% усяго насельніцтва. Некітайскія народы насяляюць тэр. на З, Пн і Пд краіны. Цюркамоўныя народы (уйгуры, казахі, кіргізы і інш.) і дунгане (хуэйцзу) жывуць пераважна на ПнЗ; манголы і народы мангольскай групы — на Пн і ПнЗ; маньчжуры і народы маньчжурска-тунгускай групы, а таксама карэйцы — на ПнУ; чжуантайскай групы і групы мяа — на ПдЗ. Веруючыя вызнаюць будызм, даасізм, культ продкаў. Сярэдняя шчыльн. нас. больш за 78 чал. на 1 км². Размешчана нераўнамерна. На раўнінах у сярэднім і ніжнім цячэнні Янцзы, на Вял. Кіт. раўніне, у дэльце р. Сіцзян, уздоўж паўд.-ўсх. ўзбярэжжа, у Сычуаньскай катлавіне шчыльн. насельніцтва да некалькіх соцень чал. на 1 км², а ў асобных раёнах больш за 1000 чал. на 1 км². У некат. раёнах Унутр. Манголіі, Сіньцзяна, Тыбета, Цынхая менш за 1 чал. на 1 км². Гарадскога нас. больш за 100 млн. чал. (15%). Найб. гарады (млн. ж.): Шанхай каля 10, Пекін 7, Цяньцзінь 4. Больш за 1 млн. у гарадах Шэньян, Чунцын, Гуанчжоў, Харбін, Нанкін, Таюань, Далянь, Сіянь, Чэнду, Цындао.

Гістарычны нарыс. На тэр. К. знойдзены астанкі выкапнёвага чалавека *сінантрапа*, рэшткі ранніх першабытных культур. З сярэдзіны 2-га тысячагоддзя да н. э. ў басейне р. Хуанхэ існавала дзяржава Інь (Шан). На думку многіх вучоных, у ёй панавалі прымітыўныя рабаўладальніцкія адносіны. Паявілася іерагліфічная пісьменнасць. У 11 ст. да н. э. Інь заваявана племенем Чжоў, дзяржава якога ў 7—6 ст. да н. э. распалася на самастойныя царствы. Войны паміж імі скончыліся перамогаю царства Цынь і стварэннем у К. першай цэнтраліз. імперыі [221—207 да н. э.]. Бязлітасны паліт. прыгнёт, эксплуатацыя сялянства прывялі ў 209 да н. э. да нар. паўстанняў. Супраць цыньскіх улад выступіла і старая арыстакратыя, якая пасля стварэння цэнтраліз. дзяржавы страціла частку прывілеяў. Перамаглі паўстанцы на чале з Лю Банам — заснавальнікам дынастыі Хань [202 да н. э.— 220 н. э.].



Антыімперыялістычная дэманстрацыя ў Пекіне. 1925.

У 184 н. э. пачалося магутнае сялянскае паўстанне «жоўтых павязак», у выніку якога Ханьская імперыя распалася на тры дзяржавы. У іх, як мяркуюць многія даследчыкі, сталі пераважаць феад. адносіны. У 316 Паўн. К. захапілі качавыя народы і стварылі там 16 некітайскіх царстваў. У 589 К. аб'яднаны пад уладай дынастыі Суй. Яе змяніла дынастыя Тан [618—907]. Аслабленая сялянскім паўстаннем пад кіраўніцтвам Хуан Чао, Ван Сянь-чжы і іншых імперыя Тан у пач. 10 ст. распалася. У 2-й пал. 10 ст. зноў аб'яднана (акрамя паўн., паўн.-ўсх. уладанняў і часткі земляў на ПнЗ) пад уладай дынастыі Сун [960—1279]. У 2-й пал. 13 ст. К. заваявалі манг. феадалы, якія заснавалі дынастыю Юань [1271—1368, у Кітаі з 1280]. Нац. прыгнёт, падаткі, захоп сялянскіх зямель — прычыны нар. антыманг. паўстанняў, якія ў сярэдзіне 14 ст. ахапілі ўсю краіну (найб. значнае паўстанне «чырвоных войск»). У 1368 паўстанцы перамаглі. Да ўлады прыйшла кіт. дынастыя Мін [1368—1644].

З 16 ст. ў К. пранікаюць еўрап. каланізатары. У 1557 Партугалія на правах «арэнды» авалодала кіт. тэр. Аамынь (Макао). Класавыя супярэчнасці, барацьба паміж пануючымі групоўкамі і напады з 1618 чжурчжэньскіх плямёнаў (пазней наз. маньчжурамі) прывялі імперыю Мін да глыбокага крызісу. Паўстанні на Пн Кітая перараслі ў сялянскую вайну 1628—45, у выніку якой дынастыя Мін скінута. Аднак частка кіт. феадалаў папрасіла дапамогі ў Маньчжурыі і з удзелам яе войск задушыла паўстанне, што спрыяла захопу К. маньчжурскімі заваёўнікамі і прыходу да ўлады іх дынастыі Цын [1644—1912]. У 17 ст. пачаліся гандл. і дыпламат. адносіны К. з Расіяй. Цынскі ўрад пад ваен. пагрозай прымусіў Рускую дзяржаву падпісаць у 1689 Нерчынскі дагавор, паводле якога Расія аддавала Цынскай імперыі свае тэрытарыяльныя ўладанні на частцы левага і правага берагоў р. Амур. Кяхцінскі трактат 1727 вызначыў граніцу паміж Цынскай імперыяй і Расіяй у раёне захопленай маньчжурамі Манголіі (канчаткова граніца па Амуры вызначана Айгунскім дагаворам 1858, у Усурыйскім краі — Пекінскім дагаворам 1860). У канцы 17 ст. Цынская дынастыя захапіла Паўн. Манголію (Паўднёвая заваявана ў 1636), у 1757 знішчана Джунгарскае ханства, тэр. якога разам з пераможаным да 1760 Усх. Туркестанам (Кашгарыя) пад назвай Сіньцзян уключана ў Цынскую імперыю. У канцы 18 ст. часткаю К. стаў Тыбет. У 1-й пал. 19 ст. ўзмацнілася экспансія еўрап. дзяржаў, гал. ч. Вялікабрытаніі, якая ў 1840 пачала супраць К. першую, т. зв. «опіумную» вайну (гл. *Англа-кітайская вайна 1840—42*) і ў 1842 навязала К. нераўнапраўны Нанкінскі дагавор. Неўзабаве такія ж дагаворы К. мусіў падпісаць з Францыяй, ЗША і шэрагам інш. краін, у выніку чаго стаў ператварацца ў паўкалонію. Нар. масы змагаліся супраць прыгнятальнікаў. У 1841—49 зарэгістравана 110 паўстанняў і хваляванняў. У 1850 пачалася сялянская вайна тайпінаў, якую маньчжура-кіт. рэакцыя з дапамогаю англ., франц. і амер. інтэрвентаў задушыла толькі ў 1864. У канцы 19 ст. ў К. складваўся капіталістычны ўклад. Паражэнне К. ў вайне 1894—95 з Японіяй спрыяла новаму націску імперыялістычных дзяржаў на

цынскі ўрад. Германія, Францыя, Вялікабрытанія і Расія пачалі «арандаваць» у К. тэрыторыі. Капітуляцыйная палітыка цынскага ўрада стымулявала барацьбу прагрэс. сіл. У К. зарадзіўся бурж.-рэвалюц. рух на чале з *Сунь Ят-сенам*, які стварыў першую ў краіне рэвалюц. арг-цыю Сінчжунхой («Т-ва адраджэння Кітая»). У 1899 выбухнула антыімперыял. *Іхэтуаньскае паўстанне*. Каб задушыць яго і ўмацаваць свае пазіцыі ў К., Вялікабрытанія, Германія, Аўстра-Венгрыя, Францыя, Японія, ЗША, Расія, Італія арганізавалі ў 1900 інтэрвенцыю ў К., якая скончылася падпісаннем 7.9.1901 Заключнага пратакола. Ён замацаваў паўкалан. становішча Цынскай імперыі. Эпоха «абуджэння Азіі», якая пачалася пасля рэвалюцыі 1905—07 у Расіі, адзначана ў К. ўмацаваннем бурж.-рэвалюц. руху. У жн. 1905 Сунь Ят-сен стварыў рэвалюц. партыю Тунмэнхой («Саюзная ліга»). Яе праграма — скінуць маньчжурскі ўрад, устанавіць рэспубліку, «ураўнаваць правы на зямлю». 10.10.1911 у правінцыі Хубэй паўсталі рэвалюцыйна настроеныя воінскія часці. Пачалася бурж. рэвалюцыя 1911—13. У снеж. 1911 сход прадстаўнікоў рэвалюц. правінцый выбраў Сунь Ят-сена часовым прэзідэнтам Кіт. рэспублікі. Аднак пад націскам правага крыла Тунмэнхоя і пад пагрозай ваен. інтэрвенцыі імперыялістаў Сунь Ят-сен пайшоў на згоду з Юань Шы-каем — лідэрам рэакц. колаў Паўн. К. 12.2.1912 дынастыя Цын адраклася ад трону. Манархія была ліквідавана. Сунь Ят-сен адмовіўся ад пасады часовага прэзідэнта на карысць Юань Шы-кая, які з дапамогаю контррэвалюц. сіл і з падтрымкаю імперыял. краін задушыў рэвалюцыю, устанавіў ваен. дыктатуру. У 1-ю сусв. вайну Японія ўмацніла экспансію ў К., у 1915 выступіла з 21 патрабаваннем — разгорнутай праграмай ператварэння К. ў залежную ад яе краіну. Урад Юань Шы-кая прыняў большасць патрабаванняў. Пасля смерці Юань Шы-кая (1916) улада ў Паўн. К. (цэнтр Пекін) асталася за мілітарысцкімі вярхамі. Паўд. правінцыі адмовіліся прызнаць уладу Пекіна. У вер. 1917 урад Паўд. К. ўзначаліў Сунь Ят-сен. У жн. 1917 урад Паўн. К. абвясціў вайну Германіі. За час вайны аслабла цэнтраліз. ўлада, узмацнілася роля мілітарысцкіх вярхоў.

Перамога Вял. Кастр. сацыяліст. рэв. зрабіла велізарны ўплыў на К. У 1918 Сунь Ят-сен накіраваў У. І. Леніну і Сав. ўраду тэлеграму, у якой выказаў спадзяванне, што кіт. і рус. рэвалюц. партыі аб'яднаюцца для сумеснай барацьбы. У краіне ўспыхнуў масавы антыімперыял. рух «чацвёртага мая», пачаўся ўздым рабочага руху. У 1921 створана *Камуністычная партыя Кітая* (КПК). Значныя змены адбыліся ў паліт. светапоглядзе Сунь Ят-сена. У 1923 ён пайшоў на збліжэнне з КПК і рабоча-сялянскім рухам, узначаліў урад К. ў Гуанчжоў, які стаў базай рэвалюцыі, што нарастала. Па просьбе Сунь Ят-сена СССР накіраваў у К. паліт. і ваен. саветнікаў (М. М. Барадзіна, В. К. Блюхера і інш.). На базе супрацоўніцтва КПК і засн. у 1912 нац.-бурж. партыі Гаміньдан, якую ўзначальваў Сунь Ят-сен, да 1924 склаўся адзіны рэвалюц. фронт пралетарыяту, сялянства, нац. буржуазіі. Пад уздзеяннем патрабаванняў прагрэс. грамадскасці пекінскі ўрад падпісаў з СССР 31.5.1924 пагадненне аб агульных прынцыпах урэгулявання пытанняў паміж СССР і К. Паводле яго ўстаноўлены дыпламат. адносіны. СССР пацвердзіў, што адмаўляецца ад усіх прывілеяў, якімі рус. царызм, як і інш. імперыял. краіны, карыстаўся ў К. З шырокага антыімперыял. руху «трыццатага мая» ў К. пачалася рэвалюцыя 1925—27.

Урад у Гуанчжоў абвясціў сябе 1.6.1925 Нац. урадам. Перамогі Нац. рэвалюц. арміі (НРА) у 1925 і пач. 1926 забяспечылі ўстанаўленне рэвалюц. улады яшчэ ў некалькіх правінцыях. У ліп. 1926 НРА пачала Паўн. паход і вызваліла правінцыі Хунань, Хубэй, Цзянсі, Фуцзянь. У сак. 1927 паўсталі рабочыя Шанхая. Неўзабаве быў вызвалены Нанкін. Нац. буржуазія, напалоханая ростам рэвалюц. руху, пад націскам імперыял. дзяржаў пачала адыходзіць ад рэвалюцыі. Правае крыло Гаміньдана на чале з Чан Кай-шы з дапамогаю імперыялістаў 12.4.1927 зрабіла контррэвалюц. пераварот у Шанхаі і Нанкіне, потым у Гуанчжоў. Чан Кай-шы сфарміраваў у Нанкіне контррэвалюц. «Нацыянальны ўрад». У ліп. 1927 гаміньданаўцы арганізавалі контррэвалюц. пераварот у Ухані. КПК абвешчана па-за законам. У краіне ўстанавілася рэакц. дыктатура Гаміньдана, які ператварыўся ў контррэвалюц. партыю феад. памешчыкаў, буйной буржуазіі і мілітарыстаў. Гаміньданаўскі ўрад павёў варожую да СССР палітыку. Войскі К. разам з белаэмігрантамі нападалі на сав. тэрыторыю. Ва ўмовах нападання рэакцыі на б. ч. тэрыторыі К., у яго паўд. р-нах ствараліся атрады Чырв. Арміі К. (ЧАК) і органы мясцовай рэвалюц.-дэмакр. улады — Саветы. Гаміньданаўскія войскі зрабілі 5 карных паходаў супраць ЧАК. Узбр. сутычкі паміж гаміньданаўскімі войскамі і ЧАК спынены ў канцы 1936 у сувязі з агрэсіяй імперыял. Японіі, якая ялчэ ў 1931 захапіла паўн.-ўсх. правінцыі К.— Маньчжурыю, а ў 1937 зноў напала на К. Пачалася 8-гадовая нац.-вызв. вайна кіт. народа супраць яп. захопнікаў. СССР пастаўляў К. ўзбраенне, сав. лётчыкі-добраахвотнікі разам з кіт. лётчыкамі абаранялі гарады К. Сав. ўрад трымаў на Д. Усходзе значныя ваен. сілы, што скоўвала яп. армію, спрыяла барацьбе кіт. народа. Аднак гаміньданаўскі ўрад вёў тактыку пасіўнай вайны. У выніку яп. войскі захапілі Паўн. і частку Цэнтр. К., важныя прыморскія раёны на Пд краіны. Разгром пры вырашальнай ролі СССР герм. фашызму і яп. мілітарызму ў 2-й сусв. вайне, вызваленне Савецкай Арміяй Паўн.-Усх. К., уступленне шэрагу краін Еўропы і Азіі на шлях сацыялізма стварылі ўмовы для перамогі нардэмакр. рэвалюцыі ў К. У 1946 гаміньданаўская рэакцыя з падтрымкаю ЗША развязала новую грамадз. вайну супраць дэмакр. сіл, якія ўзначальвала КПК. У 1945—46 часці нар.-вызв. арміі, што знаходзіліся ў Паўн.-Усх. К., перафарміраваліся і папоўніліся сваё ўзбраенне захопленай сав. войскамі яп. трафейнай зброяй. Сав. спецыялісты памаглі за кароткі тэрмін аднавіць у Паўн.-Усх. К. чыгункі, водныя шляхі аносін, шэраг прамысл. аб'ектаў. Гэта мела вял. значэнне для ўмацавання нар.-дэмакр. улады ў Паўн.-Усх. К., які стаў найважнейшай базай барацьбы кіт. народа супраць гаміньданаўскай рэакцыі. Нар.-вызв. вайна 1946—49 скончылася перамогай нар.-дэмакр. рэвалюцыі. 1.10.1949 абвешчана ўтварэнне КНР. Рэшткі гаміньданаўскіх войск з падтрымкай ЗША ўмацаваліся на в-ве Тайвань.

СССР першы (2.10.1949) прызнаў КНР. 14.2.1950 падпісаны сав.-кіт. дагавор аб дружбе, саюзе і ўзаемадапамозе. Пры садзейнічанні СССР і інш. краін сацыяліст. лагера кіт. народ у 1949—52 аднавіў разбураную вайной гаспадарку. Нар. ўлада ўвяла дзярж. кантроль над знешнім гандлем, нацыяналізавала б. ч. ўласнасці замежных капіталістаў, канфіскавала ўласнасць буйнога капіталу. У лютым 1953 у КНР (выключаючы некат. нац. раёны) закончана агр. рэформа, каля 300 млн. беззямельных і малазямельных сялян і чл. іх сем'яў атрымалі больш за 47 млн. *га* ворнай зямлі. У 1954 прынята канстытуцыя КНР. Да 1956 сялянскія гасп. (96,3%) аб'яднаны ў с.-г. вытворчыя кааператывы. Да канца года большасць прыватнакапіталіст. прамысл. і гандл. прадпрыемстваў рэарганізавана ў змешаныя дзярж.-прыватныя, якімі кіравала дзяржава. Кааператываліся дробныя прыватныя гандл. і саматужныя прадпрыемствы. За 1-ю пяцігодку (1953—57) з дапамогаю СССР створаны новыя галіны прамысловасці: авіяц.,

аўтамаб., станкабуд., шэраг галін хім. і машынабуд. прамысловасці. Выкананы план развіцця с. гасп., палепшана матэрыяльнае і культ. жыццё нар. мас. У 1953—54 падпісаны сав.-кіт. пагадненні, паводле якіх Сав. ўрад даў згоду памагчы КНР пабудаваць і рэканструяваць 161 прамысл. аб'ект, паставіць абсталяванне на 3 млрд. руб. У К. накіраваны тысячы сав. спецыялістаў. У ВНУ і на прадпрыемствах СССР атрымалі падрыхтоўку многія кіт. спецыялісты і рабочыя. Паспяхова развіваліся сав.-кіт. гандл. і культ. сувязі. У развіцці эканомікі і культуры КНР памагалі ГДР, Польшча, Чэхаславакія, Венгрыя і інш. сацыяліст. краіны. VIII з'езд КПК (вер. 1956) пацвердзіў сацыяліст. знешнепаліт. курс КНР, вырашыў надалей «умацоўваць і ўмацняць вечную і непарушную братнюю дружбу з вялікім Сав. Саюзам і ўсімі краінамі нар. дэмакратыі», ва ўнутр. палітыцы — максімальна задавальняць матэрыяльныя і культ. патрэбы народа. У 2-м пяцігадовым плане (1958—62) з'езд вызначыў рост нац. даходу на 50%, павелічэнне збору харчовых с.-г. культур з 11 да 15 млрд. пудоў. У 1958—59 заключаны новыя сав.-кіт. пагадненні аб буд-ве і расшырэнні з дапамогаю СССР 125 прамысл. прадпрыемстваў у К. Аднак неўзабаве групоўка на чале з Мао Цзэдунам пайшла на зрыў рашэнняў з'езду. За час т. зв. «вялікага скачка» было вырашана (без эканам. абгрунтавання) павялічыць прамысл. вытворчасць у 6,5, а с.-г.— у 2,5 раза; перавесці с.-г. кааператывы на становішча «народных камун» з адменай прынцыпу аплаты па працы, з абагуленнем усіх прысядзібных участкаў і асабістай маёмасці, з увядзеннем ваен. арганізацыі і дысцыпліны. Усё гэта сведчыла пра тое, што кіраўніцтва КПК і КНР адыходзіць ад марксісцка-ленінскіх прынцыпаў у сацыяліст. буд-ве. «Вялікі скачок» дэзарганізаваў прамысл. вытворчасць, аб'ём яе значна скараціўся. З 1961 установка на «вялікі скачок» фактычна адменена, рабіліся захады, каб «урэгуляваць пар. гасп.», г. зн. ліквідаваць прычыненыя ёй страты.

Дэлегацыі КПК удзельнічалі ў рабоце маскоўскіх Нарад прадстаўнікоў камуніст. і рабочых партый 1957 і 1960, падпісалі прынятыя там дакументы. Але ў гэтыя гады выявіліся розногалоссі кіраўніцтва КПК з КПСС і інш. братнімі партыямі. Кіраўнікі КПК выступілі са сваёй асабістай, не сумяшчальнай з ленінізмам ідэйна-паліт. платформай, накіраванай на барацьбу супраць сацыяліст. краін, на раскол міжнар. камуніст. і ўсяго антыімперыял. руху. Нацыяналіст. элементы, што згрупаваліся вакол Мао Цзэ-дуна, разгарнулі барацьбу за перагляд ген. лініі КПК, за адыход ад рашэнняў яе VIII з'езду. Амаль поўнасцю спынена эканам., навук.-тэхн. і культ. супрацоўніцтва з СССР і інш. сацыяліст. краінамі. Рэзка павялічыліся эканам. сувязі К. з развітымі капіталіст. краінамі, асабліва з Японіяй і ФРГ. Узмацніліся тэндэнцыі на збліжэнне з ЗША. Нацыяналіст. авантурыстычны курс унутр. і знешняй палітыкі кіт. кіраўніцтва прынёс страты найперш эканоміцы КНР, што выклікала сярод народа і чл. КПК, у т. л. сярод адказных работнікаў, незадаволенасць і крытыку. Каб зніштожыць апазіцыю, зрабіць паслухмяным народ, выкараніць пачуццё дружбы і сімпатыі да СССР і КПСС, прыхільнікі Мао Цзэ-дуна арганізавалі ў 2-й пал. 60-х г. т. зв. «культурную рэвалюцыю». Пры падтрымцы ашуканай часткі моладзі і арміі яны адхілілі ад кіраўніцтва КПК і КНР многіх вядомых дзеячаў. Рэпрэсіравана вял. колькасць чл. КПК. Усе мясцовыя парт. і канстытуцыйныя дзярж. органы ўлады разагнаны, іх замянілі «рэўкомы», дзе гал. роля належыць ваенным. Культ асобы Мао Цзэ-дуна даведзены да крайнасці. Узмацніліся ганенні на прадстаўнікоў некітайскіх народаў і іх асіміляцыя. Штучна створана атмасфера ваен. небяспекі. Узяты курс на мілітарызацыю краіны. Кіт. кіраўніцтва стала на шлях ускладнення адносін з СССР, аж да інцыдэнтаў (1969) на савецка-кіт. граніцы. Узнік ваен. канфлікт з Індыяй. IX з'езд КПК (крас. 1969) абвясціў «ідэі Мао» марксізмам-ленінізмам сучаснай эпохі, падкрэсліў неабходнасць давесці да канца барацьбу з СССР, КПСС, з інш. сацыяліст. краінамі і камуніст. партыямі. Вялікадзярж., нацыяналіст. палітыку кіт. кіраўніцтва асуджае абс. большасць камуніст. партый, прагрэс. сілы свету. КПСС абвяргае выдумкі кіт. прапаганды адносна палітыкі Сав. дзяржавы, разам з тым выступае за нармалізацыю адносін паміж СССР і КНР, за аднаўленне добрасуседства і дружбы паміж сав. і кіт. народамі. СССР належыць значны ўклад у аднаўленні правоў КНР у ААН (да 1971 ва ўсіх органах ААН быў прадстаўнік Тайвання).

Палітычныя партыі, Народны палітычны кансультатыўны савет Кітая, прафсаюзы. *Камуністычная партыя Кітая* (КПК). Засн. ў 1921. У КНР ёсць 8 дэмакр. партый і груп, якія выражаюць інтарэсы пераважна нац. буржуазіі і бурж. інтэлігенцыі. Усе прызнаюць кіруючую ролю КПК. Народны палітычны кансультатыўны савет Кітая. Засн. ў 1949. Вышэйшы орган Адзінага нар.-дэмакр. фронту. Аднаў на чале з КПК дэмакр. партыі, грамадскія арг-цыі, прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей К., частку кіт. эмігрантаў. З 1966 звестак пра дзейнасць савета няма. Усекітайская федэрацыя прафсаюзаў, цэнтр. камсамольскія і многія грамадскія арг-цыі К. фактычна распушчаны.

Народная гаспадарка. Эканам. развіццё К. да 1949 стрымлівалася адсталымі вытв. адносінамі, залежнасцю краіны ад замежнага капіталу, шматгадовай барацьбой супраць інтэрвентаў. У вёсцы панавалі феад. і ліхвярская эксплуатацыя. Большую частку насельніцтва складалі батракі і беднякі. Асн. галіны прамысловасці, чыгункі, фінансы, знешні гандаль знаходзіліся ў руках замежных манаполій. Удзельная вага прамысл. прадукцыі ў нар. гасп. ў 1937 склала 17%. Пасля 1949 ажыццёўлены важныя сац.-эканам. пераўтварэнні,





Завод цяжкіх станкоў у Ухані (злева).
Распрацоўка вугальнага разрэзу на Фушуньскім радовішчы.

У 1953 у асноўным закончана агр. рэформа. У 1952 закончылася аднаўленне разбуранай доўгімі войнамі нар. гасп., а ў 1953—57 выкананы 1-ы пяцігадовы план, у выніку чаго ў К. закладзены асновы сучаснай індустрыі, каапераваны сяляне і саматужнікі. Вял. дапамогу нар. гасп. К. атрымала ад сацыяліст. краін, асабліва ад СССР. З дапамогай СССР у К. пабудавана больш за 200 буйных прадпр. і аб'ектаў, створаны цэлыя галіны прамысловасці. У 1957 аб'ём прамысл. вытворчасці К. ў 2,8 раза перавысіў узровень 1936. Пасля 1956 пачаліся спробы «пераскочыць» цераз шэраг неабходных этапаў развіцця, ігнараванне эканам. законаў сацыялізма, што стварыла ў гасп. сур'ёзныя дыспрапорцыі. З 1960 у К. не друкуюцца стат. звесткі пра стан эканомікі. З канца 1968 робяцца намаганні стабілізаваць эканам. становішча. К. па вытворчасці найважнейшых відаў прамысл. і с.-г. прадукцыі, асабліва на душу насельніцтва, яшчэ далёка адстае ад перадавых краін свету.

Прамысловасць. За гады 1-й пяцігодкі ў К. створана аўтамабільная, трактарная, авіяц., радыётэхн. прамысловасць. Значна развіліся чорная і каляровая металургія, паліўна-энерг., хім. прамысловасць. Валавая прадукцыя прамысловасці ў 1957 павялічылася ў 6 разоў у параўнанні з 1949, ля рост працягваўся да 1960. У выніку палітыкі «вялікага скачка» валавая прамысл. прадукцыя ў 1961 скарацілася на ⅓ у параўнанні з 1960 і толькі ў 1965—66 дасягнула ўзроўню 1960. Вял. страты эканоміцы К. прычыніла «культурная рэвалюцыя». Асн. частка прамысловасці сканцэнтравана ва ўсх. раёнах К. Аснова энерг. балансу К.— вугаль. Запасы яго каля 1200—1500 млрд. *т*. Па агульным аб'ёме здабычы вугалю К. займае 3-е месца ў свеце, а ў разліку на душу насельніцтва ўступае больш чым 20 краінам. Створана нафтавая прамысловасць, перапрацоўка нафты ў Ланьчжоу, Даляні, Нанкіне, Шанхаі (гл. табл. 3 пра вытворчасць найважнейшых відаў прамысл. прадукцыі). Значна выраслa вытворчасць эл. энергіі, але ў разліку на душу насельніцтва яна яшчэ нізкая. Эл. энергію выпрацоўваюць ЦЭС, размешчаныя непадалёку ад вугальных басейнаў і ў вял. гарадах. Ёсць гідраэлектрастанцыі, найбольшая Фынманьская на р. Сунгары (магутнасць каля 570 тыс. *квт*). Асн. цэнтры чорнай металургіі на ПнУ і У краіны: Аньшань, Ухань, Баатоў, Шанхай, Пекін, Таюань. Развіта каляровая металургія. Па здабычы сурмы, волава і вальфраму К. займае адно з першых месцаў у свеце. Выплаўка медзі, свінцу, алюмінію ў гарадах Шэньян, Фушунь, Харбін. Важная галіна кіт. індустрыі — машынабудаванне (вытворчасць аўтамабіляў, трактароў, станкоў, металургічнага, горнага і энерг. абсталявання, самалётаў, лакаматываў, суднаў, складаных і дакладных машын і інш.). Вытворчасць аўтамабіляў: Чанчуньскі аўтазавод (пабудаваны ў 1-й пяцігодцы з дапамогаю СССР), невял. аўтазаводы ў Нанкіне, Шанхаі, Пекіне, Цзінані. Асн. цэнтр трактарабудавання — Лаян; ёсць з-ды ў Цяньцзіні, Шанхаі, Шэньяне і інш. Выпуск аўтамабіляў

Табліца 3

Вытворчасць найважнейшых відаў прамысловай прадукцыі Кітая

Віды прадукцыі	Адзінка вымярэння	Гады				
		1949	1952	1957	1959	1970, ацэнка
Вугаль	млн. *т*	32,4	66,5	130,0	348,0	230—260
Нафта	млн. *т*	0,12	0,44	1,45	3,7	15—20
Электраэнергія	млрд. *квт·гадз*	4,31	7,3	19,3	41,5	70—85
Сталь	млн. *т*	0,16	1,4	5,35	13,4	15—16
Мінеральныя ўгнаенні	млн. *т*	0,03	0,18	0,63	1,30	10—12
Баваўняныя тканіны	млрд. *м*	1,9	3,8	5,0	7,5	8—8,5

Выпрабаванне першага кітайскага трактара, выпушчанага з дапамогай савецкіх спецыялістаў.





Гуансі-Чжуанскі аўтаномны раён. Збор ананасаў каля Наньніна.

50—55 тыс. шт., трактароў — 35—40 тыс. шт. у год (ацэнка, 1970). Цяжкае машынабудаванне на ПнУ К. (Шэньян, Фулаэрцзі, Харбін), у Лояне, Таюане, Шанхаі, Ланьчжоў; большасць з іх створана і рэканструявана ў гады 1-й пяцігодкі з дапамогаю СССР. Найб. цэнтры станкабудавання — Шанхай, Шэньян, Далянь, чыг. машынабудавання — Далянь і Цындао, радыётэхн. прамысловасці — Пекін, Нанкін, Чэнду. Вытворчасць мінер. угнаенняў у Даляні, Нанкіне, Цзіліне. Вытворчасць баваўняных тканін у Шанхаі, Цяньцзіні, Цындао, Пекіне.

Сельская гаспадарка. У с. гасп. занята ⅘ самадзейнага насельніцтва, у асн. каапераваныя сяляне. Дзярж. сектар прадстаўлены дзярж. гаспадаркамі (дзяржгасамі). Гал. галіна с. гасп. К.— земляробства. Апрацоўваецца каля 12% тэр. краіны, ⅓ апрацаваных зямель арашаецца. Земляробства заснавана пераважна на ручной працы, машынамі апрацоўваецца каля 10% ворнай зямлі. У с. гасп. працуе 120—130 тыс. умоўных (у пераліку на 15-сільныя) трактароў пры мінімальных патрэбах 1—1,2 млн.; уносіцца каля 10 млн. *т* мінер. угнаенняў (30% неабходнага мінімуму). Вытворчасць збожжа ацэньваецца ў 200—220 млн. *т* (1970). Найб. важная збожжавая культура — рыс (⅕ усёй ворнай зямлі, да ½ збору збожжавых). Асн. раёны — басейны Янцзы і Сіцзяна (2 ураджаі за год). На Паўн.-Кітайскай раўніне і на ПнУ пасевы пшаніцы, проса, гаоляну. Пашыраны пасевы батату. З тэхн. культур найб. значэнне мае бавоўнік. Збор бавоўніку-валакна ацэньваецца ў 1,7—1,8 млн. *т* (1970). З алейных культур — пасевы соі, арахісу і рапсу. Вырошчваюць чай, амаль усюды тытунь; у дэльце Янцзы і ў нізоўях Сіцзяна — шаўкаводства. Жывёлагадоўля развіта слаба. Найб. значэнне мае свіна- і птушкагадоўля. Гадуюць авечак, вярблюдаў, у Тыбеце — якаў.

Транспарт і гандаль. ⅘ грузаабароту К. прыпадае на чыгункі. Даўж. чыгунак 40 тыс. *км* (1970); Сканцэнтраваны на У краіны. Аўтамаб. дарог каля 550 тыс. *км* (у т. л. менш як ½ са штучным пакрыццём); унутр. суднаходных шляхоў 160 тыс. *км*. Марскі флот выконвае пераважна кабатажныя перавозкі. Тапаж гандл. флоту 772 тыс. бр. рэг. *т*. Гал. порты: Шанхай, Далянь, Цяньцзінь, Цындао, Гуанчжоў (Кантон). Агульны аб'ём знешнегандл. абароту К. каля 4 млрд. дол. (1970). На капіталіст. краіны прыпадае больш за 80%, на сацыяліст.— менш як 20%. К. вывозіць с.-г. прадукты (⅔ экспарту краіны), шчацінне, тэкстыль; прывозіць спец. сталі, каляровыя металы, грузавыя аўтамашыны, вадкае паліва, вылічальныя машыны, абсталяванне для сувязі, мінер. ўгнаенні, каля 4,5 млн. *т* збожжа штогод. Асн. партнёры ў гандлі: Японія, Сінган, ФРГ, Вялікабрытанія. Грашовая адзінка — юань.

Узброеныя сілы (Народна-вызваленчая армія) складаюцца з сухапутных войск, ВПС, ВМФ, пагранічных войск і войск грамадскай бяспекі. Вышэйшы орган ваен. кіравання — дзярж. камітэт абароны, фактычна яго функцыі выконвае ваен. савет пры ЦК КПК. Непасрэднае кіраўніцтва войскамі ажыццяўляе міністр абароны. Армія камплектуецца на аснове воінскай павіннасці. На ваен. службу прызываюцца асобы ад 18 да 25 гадоў. У К. прызыўнога кантынгенту значна больш, чым патрэбна для папаўнення ўзбр. сіл, таму ў армію робяцца выбарачны прызыў па разнарадках мін-ва абароны спецыяльна створанымі часовымі камітэтамі. Ваен. камандныя кадры рыхтуюцца ў ваен. акадэміях, ваен. ін-тах, вышэйшых і сярэдніх вуч. і на розных курсах перападрыхтоўкі каманднага саставу. Тэрыторыя К. падзелена на 12 ваен. акруг: Шэньянскую, Пекінскую, Цзінаньскую, Нанкінскую, Фучжоўскую, Уханьскую, Гуанчжоўскую, Ланьчжоўскую, Сіньцзянскую, Чэнду скую, Куньмінскую і Тыбецкую. У вял. ваен. акругі ўваходзяць ад адной да некалькіх правінцыяльных ваен. акруг. Армія мае розныя віды сучаснай зброі, узмоцнена распрацоўваецца ракетная і яд. зброя. З кастр. 1964 да 1971 праведзена 12 яд. выбухаў. Армія з'яўляецца апорай групы Мао Цзэ-дуна ў ажыццяўленні антымаркісцкай, антысав. лініі ў знешняй палітыцы.

Ахова здароўя. Паводле канстытуцыі (1954) сістэма аховы здароўя дзяржаўная, бясплатная. Было (1958) 371 453 бальнічныя ложкі, 17 833 амбулаторыі і паліклінікі, 626 спецыялізаваных дыспансераў, акрамя таго, у сістэме прамысл. мін-ваў і прафсаюзаў 767 бальніц на 67 303 ложкі, 12 484 паліклінікі і пункты аховы здароўя, 64 268 санаторных ложкаў. Працавала 73,5 тыс. ўрачоў, 478 749 урачоў нар. медыцыны, 299,6 тыс. чал. сяродняга мед. персаналу. Урачэбныя і фармацэўтычныя кадры рыхтуюцца ў 32 мед., 4 нар. медыцыны і 2 фармацэўтычных ін-тах. У 1953 нараджальнасць 32,6, смяротнасць 12,2, натуральны прырост 20,3 на 1 тыс. ж.; дзіцячая смяротнасць 110 на 1 тыс. народжаных. Курорты: Далянь, Цындао, Лушань, Тайху, Ханчжоў, Сіньчэн, Сіаташань, Тангандзы, Цунхуа, Куньмін, Мугансань, Тайшань і інш.

Асвета, навуковыя ўстановы. Да 1949 навучанне было даступна толькі дзецям капіталістаў і памешчыкаў, больш за 85% насельніцтва было непісьменнае. Урад КНР правёў мерапрыемствы па ліквідацыі непісьменнасці. 10.8.1951 прынята пастанова аб развіцці шырокай сеткі дзярж. пач. і сярэдніх школ, школ для дарослых, курсаў па ліквідацыі непісьменнасці, школ для дарослых работнікаў, прафтэхкурсаў, перагледжаны навуч. праграмы, уведзена новая сістэма нар. адукацыі: дзіцячыя сады ад 3 да 7 гадоў, пач. школа 6-гадовая (4+2); 6-гадовая сярэдняя школа двюх ступеняў (па 3 гады кожная). Пед. вучылішчы 1-й ступені з тэрмінам навучання 3—4 гады і 2—4-гадовыя прафесійныя вуч. 1-й ступені на базе пач. школы. Пед. вуч. 2-й ступені з тэрмінам навучання 3 гады і 2—4-гадовыя прафесійныя вуч. 2-й ступені на базе сярэдняй школы. У 1959/60 навуч. г. ў садах было каля 30 млн. дзяцей, у пач. школах каля 90 млн., у сярэдніх агульнаадукацыйных — больш за 8,5 млн. вучняў, у прафесійна-тэхн. вуч. (1958/59 навуч. г.)— 850 тыс., у пед. вуч.— 620 тыс. чал. Шырокае развіццё набыла вышэйшая адукацыя. У 1957 было 227 ВНУ, у т. л. 15 ун-таў, 48 тэхн. ін-таў, 53 пед. ін-ты, у якіх навучалася каля 408 тыс. студэнтаў. Многа студэнтаў навучалася ў СССР і інш. сацыяліст. краінах. Сярод ВНУ: Пекінскі ун-т (засн. ў

1898), Пекінскі пед. ін-т (1902), політэхн. ін-т «Цынхуа» (1911), Нанькайскі ун-т у Цяньцзіні (1919), Сямыньскі ун-т (1921), Народны ун-т у Пекіне (1950) і інш. У 1958, калі была аб'яўлена палітыка «вялікага скачка» і «народных камун», настаў крызіс нар. асветы, які дасягнуў вяршыні ў 1966 у час т. зв. «культурнай рэвалюцыі». 13.6.1966 ЦК КПК і Дзярж. савет КНР прынялі пастанову аб «рэформе навучання», паводле якой заняткі ў сярэдніх школах і ВНУ спыняліся, а навучэнцы павінны былі ўдзельнічаць у «культурнай рэвалюцыі». Быў скарочаны тэрмін навучання, перагледжаны навуч. праграмы, гал. ўвага аддавалася вывучэнню ідэй Мао Цзэ-дуна. «Культурная рэвалюцыя» адмоўна адбілася на культурным і духоўным развіцці кіт. народа, прычыніла вял. страты навукам, навук. установам. Б-кі: Нац. ў Пекіне, б-ка Кітайскай АН, Пекінская гар. публічная, Пекінскага ун-та, б-кі ў галоўных гарадах правінцый. Музеі: імператарскі «Гугун», цэнтр. прыродазнаўча-гістар., гістар., кіт. рэвалюцыі, Лу Сіня — усе ў Пекіне, Шанхайскі і інш.

Навуковыя ўстановы: АН К. (гл. *Кітайская акадэмія навук*), засн. ў 1949, Акадэмія мед. навук у Пекіне, Кітайская акадэмія с.-г. навук, атамны рэактар, 60 навук. т-раў у галіне навукі, тэхнікі, культуры і мастацтва.

Друк, радыё, тэлебачанне. У 1958 у КНР выдавалася 1834 газ. і 818 час. (у т. л. больш за 60 газ. і час. на мовах нац. меншасцей). У час т. зв. «культурнай рэвалюцыі», у 2-й пал. 60-х г. многія цэнтр., правінц. газеты і часопісы, амаль усе органы грамадскіх арг-цый, галіновыя і мясцовыя выданні закрыты. У 1968 у каталог для падпіскі ўключана 55 назваў газет і часопісаў, у т. л. толькі 4 на нац. мовах К. Гал. газеты: «Жэньмінь жыбао» («Народная газета»), орган ЦК КПК; «Цзефанцзюнь бао» («Нар.-вызв. армія»), орган Ваен. к-та ЦК КПК і мін-ва абароны КНР; «Гуанмін жыбао» («Святло»), орган дэмакр. партыі К. Часопіс «Хунцы» («Чырвоны сцяг») — тэарэт. і паліт. орган ЦК КПК. Асн. інфармацыю цэнтр. і мясцовыя газеты атрымліваюць ад тэлегр. агенцтва *Сіньхуа*. У Пекіне — Цэнтр. нар. радыёвяшчальная станцыя, перадачы якой рэтрансліруюць 5 буйных радыёстанцый краіны; працуюць 13 тэлевізійных станцый.

Літаратура. Л-ра К. мае вялікія пісьмовыя традыцыі (каля 3 тыс. гадоў). Вызначаецца вамкнёнасцю развіцця (да 19 ст.), асаблівасцямі, абумоўленымі іерагліфічнай пісьменнасцю. Не вытокі ў фальклоры (кн. «Шыцзін» — зб. 305 нар. песняў і гімнаў 11—6 ст. да н. э.). У 4—3 ст. да н. э. на поўдні К. ў царстве Чу варадзіўся паэт. жанр «чускія строфы», прадстаўнік якога Цюй Юань — першы вядомы ў гісторыі кіт. л-ры паэт. «Чускія строфы» зрабілі ўплыў на станаўленне жанру фу — квяцістай пышнай оды. Асаблівае месца ў гісторыі кіт. паэзіі займалі нар. песні юэфу, якія з 2 ст. да н. э. збіраліся спец. «Музычнай палатай». У 4—5 ст. Тао Юань-мін першы з паэтаў апяваў чалавека працы. У 5—6 ст. фарміруюцца асновы класіч. вершаскладання з характэрным чаргаваннем 4 муз. таноў. Кіт. паэзія расквітнела ў эпоху Тан (*Ван Вэй, Лі Бо, Ду Фу, Бо Цзюй-і*). На мяжы эпох Тан і Сун паяўляецца новы від песеннай паэзіі — цы (раманс); прадстаўнікі яго Аўян Сю, Су Шы, Лу Ю і інш. далі ўзоры высокай лірычнай патрыят. паэзіі. Стараж. праваічныя філас. і гістар. творы ўбіраюць у сябе міфы, элементы казак, легенды. У эпоху Тан развіваецца маст. навела. Вяршыня гэтага жанру — чарадзейныя навелы *Пу Сун-лінга* (17—18 ст.). У сярэднія вякі пісьмова і вусна пашыраецца песенна-праваічная л-ра. У 7—9 ст. папулярны будыйскі сказ бяньвэнь. У эпоху Сун фарміруецца гарадская аповесць хуабэнь, найвосныя гісторыі нашага часу і старажытнасці». Узнікла драма, блізкая да хуабэнь. Пры дынастыі Юань драма даслягнула найб. росквіту. Рэаліст. адлюстраванне рэчаіснасці, дэмакратызм, сац. накіраванасць характэрныя п'есам *Гуань Ханьцына*, Ма Чжы-юаня, Бо Пу, Ван Шы-фу. Юаньская і мінская драма ваклалі падмурак кіт. тэатра. Многія сюжэты прыйшлі ў драму з класіч. рамана. Шырока вядомыя «Рачныя затокі» Шы Най-аня і «Трохцарства» Ло Гуань-чжуна, «Падарожжа на Захад» У Чэн-эня. Ананімны раман «Цзінь, Пін, Мэй» пачынае бытавую лінію ў развіцці кіт. прозы. Найвыш. дасягненне класічнага рамана — «Сон у Чырвоным цераме» Цао Сюэ-цыня. У процілегласць «вульгарным» сяшо — старой сюжэтнай прозе простага люду — высока ставілася «вытанчанае пісьменства» вэнь — трактаты, даклады, каментарыі і інш. У 4—6 ст. у вэнь панаваў стыль «паралельнай прозы» з чаргаваннем 4- ці 6-складовых радкоў. Хань Юй, Лю Цзун-юань і інш. ўзначалілі рух за «старажытны стыль» (гувэнь), выступілі супраць штучных абмежаванняў «паралельнай прозы». Зараджаецца жанр апавядання пра незвычайнае і таямнічае.

Развіццю кіт. л-ры перашкаджалі вакасцянелыя феад. традыцыі, пагарда да нар. мовы, панаванне старым эстэт. нормам. Рух «4-га мая» (1919) вярнуў л-ру народу. Вялікі ўплыў на яе развіццё зрабіла знаёмства з рус. рэвалюц. і заруб. л-рамі. У 20—30-я г. пакладзены пачатак новай кіт. л-ры; *Лу Сінь* стварыў «Лігу левых пісьменнікаў» (1930—36), тэаратыкам якой стаў заснавальнік кіт. марксісцкага літ.-знаўства *Цюй Цю-бо*. Паяўляюцца раманісты (*Лао Шэ, Мао Дунь*, Ба Цзінь і інш.), драматургі (Цзянь Хань, Ся Янь, Цао Юй і інш.), паэты (*Го Мо-жо*, Цзян Гуан-цы, Інь Фу, Цзянь Цзянь і інш.). Перыяд антыяпонскай вайны — час росквіту патрыят. тэмы (т. зв. «вершы для вуліцы», «вершы-агіткі» і інш.). У 40-я г. ў л-ры вызваленых раёнаў цэнтр. месца займае вобраз камуніста. Л-ра КНР адлюстравала змены ў жыцці краіны. Тэму новай вёскі распрацоўвалі Чжао Шу-лі, Чжоў Лі-бо, Дзін Лін і інш. Упершыню ў кіт. л-ры з'явіўся вобраз рабочага (Цао Мін, Ай У і інш.). Вялікае месца ў 50-я г. належала ваен. тэматыцы. Але прымусовая рэформа класічнай драмы, курс на «непрафесійнае» мастацтва, шматлікія «творчыя дыскусіі» перашкаджалі развіццю л-ры К. «Культурная рэвалюцыя» знішчыла яе асн. кадры. Права на жыццё ў К. маюць толькі «ўзорныя п'есы», т. зв. «рэвалюцыйныя песні» і нарысы пра «новых герояў».

У перакладзе на кіт. мову выйшлі «Зялёная школа» (апавяданні, 1958) і «У Забалоцці днее» (1955) Я. Брылл, «Андрэйка» (1953) П. Кавалёва, «Людзі асобага складу» (1954) В. Казлова, «Дзед Талаш» («Дрыгва», 1958) Я. Коласа, «Пяюць жаваранкі» (1955), «Хто смяецца апошнім» (1955, 1956) К. Крапівы, «Новае рачышча» (1952), «Толькі ўперад» (1956), «Цымбалы» («Прыгоды цымбал», 1957) А. Куляшова, «Зборнік вершаў» (1946), «Жалейка» (вершы, 1958) Я. Купалы, «Палескія рабінзоны» (1956) Я. Маўра, «Выбраныя вершы» (1958) М. Танка, «У Маскву» (апавяданні, 1954, 1956) І. Шамякіна. У бел. перыёдыцы друкаваліся творы Го Мо-жо, Ду Фу, Мао Дуня, Сяо Піна, Эмі Сяо, Чжао Шу-лі, Юань Шуй-по і інш. У бел. перакладзе выйшлі кн. казак «Алень і тыгр» (1953), «Браты Лю» (1955), «Гара гаючых траў» (1960), «Казкі старога Сюня» (1960), «Кітайскія казкі» (1952), «Сто тысяч стрэл» (1959), зб. апавяданняў «Маленькі Чжуцза» (1954), «Дзеці вялікага народа» (1959), «Апавяданні кітайскіх пісьменнікаў» (1953); «Сонца над ракой Сангань» (1954) Дзін Лін, «Балвы загад» (1957) Ло Дань, «Апавяданні» (1956) Лу Сіня, «Перад світаннем» (1959) Мао Дуня, «Дзесяць маленькіх сяброў» (1960) Сань Шан-фэя, «Пісьмо з перуновымі пёрамі» (1954) Хуа Шаня, «Выбранае» (1959) Чжао Шу-лі, «Ураган» (1958) Чжоў Лі-бо.

Архітэктура. Найб. старадаўнія помнікі архітэктуры К. адносяцца да 3-га тысячагоддзя да н. э. Першыя гарады ў К. ўзніклі ў 2-м тысячагоддзі да н. э. У 11—3 ст. да н. э. яны мелі рэгулярную планіроўку. У 4—3 ст. да н. э. пастаўлена *Вялікая кітайская сцяна*. На мяжы нашай эры будаваліся шмат'ярусныя вежы, сядзібы, дамы з чарапічнымі дахамі. У архітэктуры 4—6 ст. н. э. пераплялліся мясцовыя і іншаземныя асаблівасці. Узнікаюць *пагады*. У вялізных скальных будыйскіх манастырах 4—6 ст. (Юньган у прав. Шаньсі, Майцзішань і Дуньхуан у прав. Ганьсу) спалучаліся архітэктура, скульптура і жывапіс. Развіццё архітэктуры К. 7—13 ст. звязана з агульным уздымам кіт. культуры ў перыяды Тан і Сун. Прасторавы размах, сувязь ансамбляў з прыродай, маляўнічасць вызначаюць архітэктуру сталага сярэдневякоўя. Гарадам уласцівая прамавугольная планіроўка (імператарскі палац размяшчаўся ў цэнтры). Шматпавярховыя палацы і храмы з садамі і паркамі мелі пацягнутыя лакам калоны, чарапічныя



1



2



3

Кітай I.

1. Горы Цыньлін — водападзел паміж басейнамі рэк Хуанхэ і Янцзы.
2. Краявід на Вялікай Кітайскай раўніне ў раёне горада Шаасін, правінцыя Чжэцзян.
3. Маляўнічае возера Сіху ў правінцыі Хубэй.
4. Доменныя печы металургічнага камбіната ў Аньшані, пабудаванага з дапамогай СССР.
5. Апрацоўка рысавага поля на востраве Хайнань.
6. Сяўба ў дзяржгасе Ліну, Нінся-Хуэйскі аўтаномны раён.
7. Гадоўля качак — найбольш важная галіна птушкагадоўлі ў правінцыі Цзянсу.



4



5



6













Кітай II.

1. Пекін. Вуліца Усходні Чанган.
2. Сунь Ят-сен на жалобным мітынгу, прысвечаным памяці У. І. Леніна. 1924.
3. Салдаты 8-й арміі ў баі з японскімі захопнікамі каля Вялікай кітайскай сцяны.
4. Пекін. Будынак Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў.
5. Часці Народна-вызваленчай арміі ўвайшлі ў Пекін. 1949.
6. Гуанчжоў. Лодкі на рацэ Чжуцзян — пратоцы Сіцзяна.
7. Шанхай. Агульны выгляд горада.











Кітай III.

1. Пагада Сун'юэсы на гары Суншань (правінцыя Хэнань). 520.
2. Храм Цыняньдзянь у ансамблі «Храма неба» ў Пекіне. 1420.
3. Галерэя Чанлан у парку Іхэюань у Пекіне. 18—19 ст.
4. Палац Патала ў Лхасе. 16—17 ст.
5. Парк Цзіншань у Пекіне.
6. Палац культуры нацыянальнасцей у Пекіне. 50-я г. 20 ст.








1


2


3



4


5


6

Кітай IV. 1. Статуя Буды ў пячорным храме Юньган. 5 ст. 2. Пахавальны партрэт. Шоўк, туш, вадзяныя фарбы. 18 ст. Музей мастацтваў народаў Усходу. Масква. 3. Лі Чэн. За чытаннем стэлы. Туш. 12 ст. Маст. музей. Осака. 4. Цы Бай-шы. Крабы і карпы. Папера, каляровая туш. 1952. Нац. галерэя. Прага. 5. Сюй Бэй-хун. Партрэт Рабіндраната Тагора. Папера, акварэль, каляровая туш. 1942. Музей Сюй Бэй-хуна. Пекін. 6. Хуан Чжоў. Спатканне. Папера, туш. 1957. 7. Цзян Чжао-хэ. Бежанцы. Фрагмент. Папера, туш. 1943. Музей мастацтва народаў Усходу. Масква. 8. Гу Юань. Жывы мост. Каляровая гравюра. 1949.


7


8

шырокія дахі, выгнутыя па вуглах (манастыр Фагуансы, 875). Найб. росквіту архітэктура К. дасягае ў 14—17 ст. (перыяд Мін). Планіроўка сталіцы Бэйцзіна (Пекін) складвалася з прамых магістраляў, плошчаў і ансамбляў, якія спалучалі рацыянальную яснасць з асіметрыяй і перападамі рэльефу ў садах і парках. У цэнтры Пекіна — «Забаронены горад» — грандыёзны ансамбль імператарскага палаца. Прасторавы размах адчуваецца ў пекінскім ансамблі «Храм неба» (1420—1530), у загарадным пахавальным комплексе Шысаньлін і інш. Архітэктура 18—19 ст. вызначаецца вытанчанымі дэталямі, ускладненнем дэкар. арнаменту і колеравых акцэнтаў (храм Юнхэгун, парк Іхэюань у Пекіне і інш.). У паўд. раёнах К. архітэктура больш пышная, дахі будынкаў больш крутыя, шмат дэкар. садоў. Самабытная арх. Тыбета і Сіньцзяна. Культавыя збудаванні Тыбета — манастыры і бутэлькападобныя каменныя пагады — субурганы. У Тыбеце квадратныя ў плане будынкі крапаснога тыпу звужаюцца ўверсе, маюць прыстаўныя лесвіцы, плоскія дахі. Гал. ансамбль Лхасы — горны палац Патала (7—17 ст.). З 19 ст. спрэдневяковая арх. занепадае. Пасля ўтварэння КНР распрацоўваюцца ген. планы, праекты рэканструкцыі старых і забудовы новых гарадоў, пасёлкаў і вёсак. Будаўніцтва і праектаванне вялося з дапамогаю Сав. Саюза і інш. сацыяліст. краін. Створаны шэраг жылых і грамадскіх збудаванняў (жылыя дамы Дзяржсавета, гасцініцы «Дружба», «Пекін», Палац нацыянальнасцей, Гал. вакзал у Пекіне, Палац геалогіі ў Шэньяне, грамадскія будынкі ў Нанкіне і інш.), стадыёнаў, школ. Пасля 1959 буд-ва рэзка скарацілася, перапынены работы па рэканструкцыі гарадоў і вёсак. Іл. гл. на ўкл. III.

Выяўленчае мастацтва. Старадаўнія помнікі выяўл. мастацтва К.— узоры роспісаў і чорнай керамікі 3-га тысячагоддзя да н. э. У 2-м тысячагоддзі да н. э. паявіліся шматлікія вырабы з бронзы. Зберагліся роспісы і пахавальныя рэльефы, жанравая гліняная пластыка перыяду Хань. У пахавальнях Шаньдуна і Сычуані (1—2 ст.) шмат гравіраваных па цэгле і камені кампазіцый. З пашырэннем у К. будызму (4—6 ст.) у манастырах паявіліся скульптурныя і жывапісныя выявы Буды і будыйскіх святых. У жывапісе выпрацаваліся асноўныя тыпы скруткаў на паперы і шоўку — вертыкальны (для сцен) і гарызантальны. Найб. ранніе — скруткі Гу Кай-чжы (4—5 ст.). 4—6 ст.— час росквіту маст. каліграфіі. Найвышэйшы ўздым усіх відаў і жанраў мастацтва К. прыпадае на перыяды Тан і Суп. Узнікла прыдворная Акадэмія мастацтваў. У жывапісе 7—10 ст. азначыліся традыц. жанры: партрэт (Янь Лі-бэнь, Чжоў Фан), «жывапіс кветак і птушак» (Сюй Сі), анімалістычны жанр, пейзаж («шань-шуй» — «горы-воды»). Характэрная будова прасторы ў пейзажах стварала адчуванне бязмежных даляў. Сярод жывапісцаў 7 — пач. 12 ст. Лі Сы-сюнь, Го Сі і інш. У часы завалавання краіны качэўнікамі працавалі жывапісцы Лі Тан, Ма Юань. Перыяды Тан і Суп адзначаны таксама росквітам прыкладнога мастацтва, паяўленнем фарфору. У 15—17 ст. найб. развіваюцца бытавы жанр (Чоў Ін), «жывапіс кветак і птушак» (Сюй Вэй). Розныя стылі і манеры мінулага спалучалі ў сваёй творчасці Ван Хой, Ван Шы-мінь, Юнь Шоў-пін. Пашыраецца вытворчасць фарфору (шматкаляровага з падглазураваным роспісам сінім кобальтам, свінцовымі і чырвонымі глазурамі). У 17—18 ст. ускладняюцца тэхніка і формы вырабаў фарфору (цэнтр у Цзіндэчжэні, прав. Цзянсі), развіваюцца разьба па камені, дрэве, косці, а таксама лакі, перагародчастая эмаль, тканіны, вышыўка. Паяўленне алейнага жывапісу і ўплыў зарубежных маст. кірункаў прывялі да размежавання жывапісу на нацыянальны (традыц. жывапіс тушшу — гохуа) і алейны (ёўхуа). Больш цесна звязаны з жыццём народа ў канцы 19 ст. гравюра і нар. лубок, якія асабліва пашырыліся з 20-х г. 20 ст. Значных поспехаў дасягнулі ў 40-я г. майстры гравюры. Вял. ўклад у мастацтва новага, сацыялісг. К. зрабілі жывапісцы *Цы Бай-шы*, Сюй Бэй-хун, Пан Цянь-шоў і інш. Адрадзіліся і многія галіны прыкладнога мастацтва — выразкі з паперы, лубок, лакавыя вырабы, вышыўкі і інш. Пасля 1966 мастацкае жыццё К. заняпала, «культурная рэвалюцыя» фактычна ліквідавала выяўленчае мастацтва. Ілюстрацыі гл. таксама на ўкл. IV.

Уверсе: Чжан Цзэ-дуань. Свята Цын-мін на рацэ (фрагмент). Шоўк, туш, вадзяныя фарбы. 2 ст. Гістарычны музей. Пекін. Унізе. Тканіна «кэсі» з выявай «100 хлопчыкаў». 17 ст. Эрмітаж. Ленінград (злева). Размова рыбака з лесарубам. Дрэва. 19 ст. Музей мастацтва народаў Усходу. Масква.







Музыка К.— адна з найстараж. у свеце. Спачатку мела сінкрэтычны характар. Пытанні музыкі распрацоўвалі старажкіт. філосафы, матэматыкі, багасловы. Асаблівае грамадскае значэнне надаецца ёй з развіццём канфуцыянства (з 5 ст. да н. э.). Міфічнаму правіцелю Хуан-эі прыпісваецца вынаходства сістэмы люй-люй з 12 храматычных ступеняў. Здаўна склалася пентатоніка, абумоўленая асаблівасцямі кіт. мовы. З муз. інструментаў: сэ, чжэн, цінь, піпа (шчыпковыя), хуцінь (сямейства смыковых), сяо, пайсяо, шэн (духавыя). Ранні помнік кіт. муз.



Бронзавы посуд «ху» для ахвярнага віна. Перыяд Шан (злева). Ваза з роспісам каляровымі і чорнымі эмалямі. Фарфор. Канец 17 — пач. 18 ст. Музей фарфору. Дрэздэн.

культуры — «Шыцзін» («Кніга песень», 11—6 ст. да н. э.). Пры дынастыі Хань (3 ст. да н. э.— 3 ст. н. э.) спец. муз. палата Юэфу збірала і вывучала муз. фальклор. У 6—10 ст. будызм прынёс у музыку К. элементы муз. культур інш. народаў. У 8 ст. ствараюцца школы музыкі і танца, у т. л. «Кансерваторыя грушавага саду». У 12 ст. на аснове мясцовага муз. фальклору ў Паўн. К. развіваецца оперны жанр узацзюй ці бэйцюй (паўн. опера), у 14 ст. ўзнікае наньцюй (паўд. опера). Пад іх уплывам у 15 ст. дасягае росквіту муз.-тэатр. мастацтва. У перыяд Мін (14—17 ст.) канчаткова фарміруецца сістэма люй-люй на аснове раўнамернай тэмперацыі. З 17 ст. музыка К. занепадае. У 18—19 ст. адчуваюцца еўрап. ўплывы, якія ўзмацняюцца на мяжы 20 ст. Пасля 1919 прадстаўнікі рэвалюцыйна настроенай моладзі вучацца ў Еўропе, імкнучыся ўнесці ў кіт. музыку дасягненні еўрап. муз. мастацтва (сярод іх *Сі Сінхай*). У 1932 кампазітары *Не Эр* і Люй Цзі арганізавалі групу рэвалюц. музыкантаў, якія стварылі ў час нац.-вызв. руху папулярныя патрыят. масавыя песні. У першыя гады пасля 1949 кіт. ўрад ажыццявіў шэраг арганіз. мерапрыемстваў, якія садзейнічалі развіццю кіт. музыкі. З сярэдзіны 50-х г. кіт. кіраўнікі пачынаюць пераносіць метады эканам. і гасп. кіраўніцтва ў музыку, што выклікала на мяжы 60-х г. паяўленне спрошчаных вульгарызатарскіх твораў. У 60-я г. ў ходзе «культурнай рэвалюцыі» музыка зводзіцца да ілюстрацыі паліт. лозунгаў кіт. ўрада.

Сцэна са спектакля «Вежа на гары маланак». Дзярж. тэатр класічнай драмы. Пекін.



Тэатр. Вытокі кіт. т-ра ў песенна-танц. мастацтве і ў паказах нар. акцёраў. У 13—14 ст. т-р дасягнуў сталасці. Склалася юаньская драма цзацзюй, пазней чуаньцы. У 14—17 ст. паявіліся першыя лакальныя жанры кіт. т-ра: іянскі і куньшанскі (у правінцыі Цзянсі). У 19 ст. сфарміраваўся сталічны тэатр цзінсі, т. зв. пекінская муз. драма. У ёй адбіліся асн. рысы кіт. традыц. т-ра (сіцюй): падзел персанажаў на амплуа — герой шэн, гераіня дань, характэрныя мужчынскія ролі цзін, комік чоў. Ігра акцёраў умоўная, спалучае мову, спевы і танец, сцэн. мастацтва — кананізаванае. У грыме і касцюме выкарыстоўваецца сімволіка колеру і арнаменту. У рэпертуары пераважаюць гістар. п'есы і інсцэніроўкі папулярных раманаў-эпапей. Вядучыя акцёры і заснавальнікі выканаўчых стыляў (з канца 19 ст.) — Тань Сінь-пэй, *Мэй Лань-фан*, Чжоў Сінь-фан і інш. Да 1949 зберагаліся і развіваліся тэатр. традыцыі мінулага. У КНР пачалася рэформа традыц. кіт. т-ра, набывае папулярнасць т. зв. размоўны т-р (узнік у К. ў пач. 20 ст.). У 60-я г. т-р становіцца сродкам прапаганды новага паліт. курса. Пасля «культурнай рэвалюцыі» т-ры закрыты, вял. рэпертуар заменены 8 «узорнымі» п'есамі, якія адпавядаюць сучаснай палітыцы кіт. кіраўніцтва.

Кіно. Вытворчасць фільмаў пачалася ў 1908 (была ў руках іншаземцаў). У 1917 кіт. фірма выпусціла першы фільм. Некат. поспехі дасягнуты ў 30-я г., калі на кінастудыях пачалі працаваць прадстаўнікі рэвалюц. інтэлігенцыі. У вайну з Японіяй выпуск фільмаў рэзка скараціўся. Пасля 1945 дэманстраваліся пераважна амер. стужкі. Асобныя рэжысёры (Цай Чу-шэн, Шы Дун-шань, Шэнь Фу і інш.) стваралі прагрэс. фільмы. У нар. К. кінапрадпрыемствы нацыяналізаваны. Значныя фільмы: «Мост», «Дочкі Кітая», «Стальны салдат», «Сівая дзяўчына», «Маленне пра шчасце», «Крама Ліня». Асн. цэнтры кіно — Пекін, Шанхай, Чанчунь. З сярэдзіны 60-х г. пастаноўка маст. фільмаў спынілася; здымаюцца дакумент. фільмы, прысвечаныя пераважна афіц. урачыстасцям, прыёмам.

Літ.: Маркс К. Революция в Китае и в Европе, Маркс К. и Энгельс Ф. Соч., т. 9; яго ж. Англо-китайский конфликт.— Английские жестокости в Китае, там жа, т. 12; яго ж. Новая китайская война, там жа, т. 13; яго ж. Китайские дела, там жа, т. 15; Энгельс Ф. Новая экспедиция англичан в Китай.— Персия и Китай, там жа, т. 12; Ленін У. І. Кітайская вайна, Тв., т. 4 (Полн. собр. соч., т. 4); яго ж. Дэмакратыя і народніцтва ў Кітаі, Тв., т. 18 (там жа, т. 21); яго ж. Абноўлены Кітай, Тв., т. 18 (там жа, т. 22); яго ж. Вялікі поспех Кітайскай рэспублікі.— Прабуджэнне Азіі, Тв., т. 19 (там жа, т. 23); Книга правителя области Шан, пер. с кит., М., 1968; Смолин Г. Я. Крестьянское восстание в провинциях Хунань и Хубэй в 1130—1135 гг., М., 1961; Тайпинское восстание, 1850—1864 гг. Сб. документов, М., 1960; Восстание Ихэтуаней. Документы и материалы, М., 1968; Переломов Л. С. Империя Цинь — первое централизованное государство в Китае (221—202 гг. до н. э.), М., 1962; Симоновская Л. В. Антифеодальная борьба китайских крестьян в XVII в., М., 1966; Русско-китайские отношения в XVII веке, т. 1, 1608—1683, М., 1969; Русско-китайские отношения в 1869—1916. Официальные документы, М., 1958; Юрьев М. Ф. Революция 1925—1927 гг. в Китае, М., 1968; Астафьев Г. В. Интервенция США в Китае и ее поражение. (1945—1949 гг.), М., 1958; Ленинская политика СССР в отношении Китая. Сб. ст., М., 1968; Капица М. С. КНР: два десятилетия — две политики, М., 1969; Опасный курс, в. 1—2, М., 1969—71; Китай сегодня, М., 1969; Никифоров В. Н. Советские историки о проблемах Китая, М., 1970; Борисов О. Б. и Колосков Б. Т. Советско-китайские отношения. 1945—1970, М., 1971; Внешняя политика КНР, М., 1971; Ленин и проблемы современного Китая, М., 1971; Тихвинский С. Л. Движение за реформы в Китае в конце XIX века и Кан Ю-вэй, М., 1959; яго ж. Сунь Ят-сен. Внешнеполитические воззрения и практика, М., 1964; Семанов В. И. Эволюция китайского романа, М., 1970; Надеев И. М. «Культурная революция» и судьба китайской литературы, М., 1969; Всеобщая история архитектуры, т. 1, М., 1970; Всеобщая история искусств, т. 1, М., 1956; т. 2, кн. 2, М., 1961; т. 6, кн. 2, М., 1966; Искусство стран и народов мира, т. 2, М., 1965 (бібліягр.);

Лисевич И. С. Древняя китайская поэзия и народная песня, М., 1969.

С. М. Зубаў (прырода), *Дз. П. Бяляцкі* (ахова здароўя). Мінск; *Я. М. Бергер* (насельніцтва, гаспадарка), *Я. А. Бялоў* (гістар. нарыс), *У. З. Клепікаў* (асвета, навук. ўстановы), *І. С. Лісевіч* (літаратура), *С. А. Сярова* (тэатр). Масква.

КІТА́ЙКА, кітайская, слівалістая яблыня (Malus prunifolia), від яблыні з дробнымі пладамі. Мароза- і засухаўстойлівы, ужываецца як прышчэпа. Культывуецца ў паўн. раёнах пладаводства, у сярэдняй палосе, Паволжы, Сібіры, на Урале і Д. Усходзе.

К. пачынае рана пладаносіць, дае вялікія ўраджаі. Плады маюць розную форму, афарбоўку і смак, выкарыстоўваюцца на перапрацоўку. І. У. Мічурын гібрыдызацыяй К. з культурнымі сартамі вывеў каштоўныя сарты: К. залатую раннюю, К. анісавую. Бельфлёр-кітайку і інш.

КІТА́ЙСКАЕ ПІСЬМО, кітайская пісьменнасць, якая заснавана на выкарыстанні пісьмовых знакаў мовы — *іерогліфаў*. Усіх іерогліфаў каля 49 тыс., у сучасных тэкстах практычна выкарыстоўваецца каля 5 тыс. Кожны іерогліф абазначае склад — аднаскладовае слова ці марфему і графічна з'яўляецца камбінацыяй рысак, упісаных у квадрат. Запіс тэксту слупкамі зверху ўніз і справа налева.

Даўнейшыя знакі	Сучасныя знакі	Гучанне	Значэнне
⊙	日	жы	сонца
☽	月	юэ	месяц
𐤀	子	цзы	дзіця
𐤁	孖	цзы	блізняты
𐤂	木	му	дрэва
門	門	мынь	вароты
𐤃	正	чжэн	правільны
𐤄	心	сінь	сэрца
𐤅	雨	юй	дождж
𐤆	犬	цюань	сабака
𐤇	巴	ба	змяя
𐤈	手	шоу	рука
𐤉	言	янь	гаварыць, слова
𐤊	中	чжун	сярэдзіна

Асн. тыпы іерогліфаў: піктаграмы — схематыч. малюнкі канкр. прадметаў; ідэаграмы — складаныя іерогліфы, спалучэнні піктаграм (склад ідэаграмы падказвае значэнне абазначанага іерогліфам слова); фанаграмы (у сучасным К. п. іх большасць) — складаныя іерогліфы; яны складаюцца з фанетыка, які паказвае гучанне слова, і ключа, што паказвае на кола паняццяў, да якіх адносіцца значэнне абазначанага слова (такая патрэба выклікаецца вялікай колькасцю ў кіт. мове амафонаў). Самыя стараж. помнікі з 15—13 ст. да н. э. Многія стагоддзі К. п. было дзярж. пісьменнасцю ў Карэі, Японіі і Анаме (В'етнаме).

КІТА́ЙСКА-ТЫБЕЦКІЯ МО́ВЫ, вялікая сям'я моў, пашыраных у Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Азіі. Распадаецца на 2 адгалінаванні: кітайска-сіямскае (кітайска-тайскае) і тыбета-бірманскае. Да першага адносяцца мовы: кітайская, таі (сіямская), в'етнамская (даўнейшая назва «анамская»), лаоская і інш. Тыбета-бірманскае адгалінаванне падзяляецца на 2 групы: тыбецкія мовы — тыбецкая, балты, гурунь, мурты і інш., і бірманскія — бірманская, кукі-чын, маніпурская. К.-т. м. характэрная наяўнасць таноў; склад звычайна з'яўляецца коранем.

КІТА́ЙСКАЯ АКАДЭ́МІЯ НАВУ́К (афіц. назва Акадэмія навук Кітая), засн. ў 1949 у Пекіне на базе 2 акадэмій — у Нанкіне (з 1928) і Пекіне (з 1929). Мае 5 аддзяленняў (1970): фізічных, матэм. і хім. навук; біял. навук; геаграфіі і геалогіі; тэхн. навук; філасофіі і грамадскіх навук. Аддзяленні аб'ядноўваюць н.-д. ін-ты. У сістэме АН 8 астр. абсерваторый, 6 бат. садоў, філіялы ў правінцыях, музей марской біялогіі і лімналогіі.

КІТА́ЙСКАЯ МО́ВА, мова кітайцаў. Належыць да кітайска-тайскага адгалінавання *кітайска-тыбецкіх моў*. Дзярж. мова КНР. На К. м. гаворыць каля 700 млн. чал.

Асн. фанет. адзінка К. м.— склад (кожны мае значэнне, выражаючы або аднаскладовае слова або марфему, кожная сэнсавая адзінка выражаецца не меней як складам). Поўны састаў кітайскага складу: пачатковы зычны, нескладаўтваральны галосны, складаўтваральны галосны, канцавы зычны або паўгалосны. Склад можа не мець поўнага саставу, але паслядоўнасць яго элементаў сталая. Ужыванне фанем абмяжоўваецца пазіцыйна, таму агульная колькасць складоў у К. м. каля 400 (з улікам 4 таноў — каля 1300). Каранёвыя элементы пераважна аднаскладовыя. Роля суфіксацыі ў словаўтварэнні невялікая; словаўтварэнне пераважна сінтакс. шляхам — складаннем каранёў. Большасць слоў сучаснай К. м. двухскладовыя (вынік складання каранёў). Паводле марфал. будовы і сінтакс. функцый словы К. м. падзяляюцца на некалькі вялікіх класаў (часцін мовы), межы паміж імі нетрывалыя. Роля словазмянення (пераважна суфіксальнае) невялікая — словазменных формаў нямнога (адносна багатая сістэма формаў толькі ў дзеяслова) і ўжыванне іх часта факультатыўнае. Словазмяненне не выкарыстоўваецца для выражэння сувязі паміж словамі. Асн. грамат. сродкі ў К. м.— парадак слоў (дзейнік перад выказнікам, выказнік перад дапаўненнем, азначэнне перад паяснёным словам), парнасць або няпарнасць пабудовы, службовыя словы, а таксама рытм, інтанацыя і сілавы націск. Групы дыялектаў К. м.: паўн. дыялекты (на іх гаворыць каля 70% насельніцтва); дыялекты «у» — правінцыя Чжэцзян, частка Цзянсу і Аньхоя (асн. шанхайскі дыялект); дыялекты «мінь» — прав. Фуцзянь і часткова Гуандун (асн. фучжоўскі дыялект); дыялекты «юэ» — прав. Гуандун, часткова Гуансі і в-аў Хайнань (асн. кантонскі дыялект). У аснове кіт. літ. мовы — байхуа — пекінская байхуа (размоўная мова), якая ўжо ў 18—19 ст. стала агульнай пісьмовай літ. моваю, зразумелаю ва ўсіх абласцях Кітая. Да сярэдзіны 20 ст. ў л-ры выкарыстоўвалася і стараж.-кіт. літ. мова — вэнь-янь, некалі заснаваная на жывых дыялектах Паўн. Кітая, але шмат стагоддзяў таму назад стала моваю кніжнаю, мёртваю. К. м. карыстаецца *кітайскім пісьмом*.

Літ.: Солнцев В. М. Очерки по современному китайскому языку, М., 1957; Китайский язык, М., 1961; Драгунов А. А. Грамматическая система современного китайского разговорного языка, Л., 1962; Юань Цзя-хуа. Диалекты китайского языка, М., 1965; Коротков Н. Н. Основные особенности морфологического строя китайского языка (грамматическая природа слова), М., 1968.

Я. А. Пацалуеўскі. Масква.

КІТА́ЙСКАЯ РУ́ЖА (Hibiscus rosa sinensis), вечназялёны куст або невялікае дрэўца сям. мальвавых. Радзіма — Паўд. Кітай, Паўн. Індыя. На Пд СССР вырошчваецца ў грунце. На Беларусі вядома як дэкар. пакаёвая і аранжарэйная расліна.



Святлолюбная расліна, выш. да 2—4 *м*. Лісце вялікае, ярказялёнае, авальнае, зубчастае. Кветкі адзіночныя, простыя ці махрыстыя, найчасцей чырвоныя, аранжавыя, жоўтыя. Плод — шматнасенная каробачка. Размнажаецца чаранкамі, насеннем.

Літ.: Киселев Г. Е. Цветоводство, 3 изд., М., 1964; Левданская П. И. и Мерло А. С. Комнатные цветочные растения, Мн., 1967.

КІТАЙСКІЯ ГУСІ, парода гусей, выведзеная прыручэннем дзікай шышкаватай гусі — суханоса, пашыранага ў Маньчжурыі, Паўн. Кітаі і Сібіры.



Сярэдняя яйцаноскасць К. г. 30—50 яец, макс. больш за 90. Маса яйца 130—140 *г*. Перыяд, калі нясуцца К. г., 115—145 дзён за год. Жывая маса гусак 4—4,5 *кг*, гусакоў 4—5, гусянят (у 75 дзён) 2,8—3,5 *кг*. Забойны выхад 82%, выхад ядомых частак 60%. На Беларусі К. г. гадуюць усюды. Пры скрыжаванні з мясными пародамі даюць каштоўныя помесі, якія маюць высокую яйцаноскасць, вял. жывую масу, смачнае мяса.

Літ.: Сельскохозяйственная птица, т. 1, М., 1962.

КІТАКЮСЮ, горад у Японіі, на Пн в-ва Кюсю. Утвораны ў 1963 ад аб'яднання гарадоў Модзі, Кокура, Табата, Явата і Вакамацу. 1042 тыс. ж. (1970). Адзін з вял. прамысл. цэнтраў Японіі. Металург., хім., машынабуд., эл.-тэхн., шкляная, ваен., харч. прамысловасць, цементныя і алюмініевыя з-ды; суднарамонтныя майстэрні.

КІТОВЫ ВУС, рагавыя пласціны ў верхняй сківіцы *бяззубых кітоў*.

Пласціны (ад 300 да 800 штук) маюць форму выцягнутага трохвугольніка (аснова 4—40 *см*, выш. ад 20 *см* да 4,5 *м*). Іх унутр. краі і верхавіна, расшчэпленая на шчаціння (даўж. 15—60 *см*), утвараюць т. зв. «сіта», праз якое кіт адцэджвае трапіўшых дробных жывёл (пераважна ракападобных), якімі корміцца. З шчаціння К. в. робяць шчоткі, ім набіваюць мэблю і інш.

КІТС (Keats) Джон (29.10.1795, Лондан — 23.2.1821), англійскі паэт-рамантык. Першы зб. «Вершы» (1817). Апяваў зямное жыццё («Ода да восені», санет «Конік і цвыркун»), услаўляў гармонію паэзіі і жыцця, прыгажосці і праўды (паэмы «Эндыміён», «Сон і паэзія», «Ода да грэчаскай вазы»). Найлепшы твор — алегарычная паэма «Гіперыён» (1820) пра барацьбу тытанаў і багоў-алімпійцаў. У паэме «Ізабела» гнеўна заклеймаваў імкненне да нажывы, сквапнасць прыгнятальнікаў. Пра паліт. радыкалізм К. сведчаць вершы «Да Касцюшкі», «Пра мір» і інш. Захапляўся шатл. фальклорам і паэзіяй Р. Бёрнса (вершы «Тэнмус», «Мег Мерыліз», «Робін Гуд»). На бел. мову вершы К. перакладаў Я. Семяжон.

Тв.: Бел. пер.— у час. «Полымя», 1954, № 4.

КІТЫ (кітападобныя), атрад водных млекакормячых. Падзяляецца на 2 падатр.: *бяззубых кітоў* і *зубатых кітоў*.

КІЦІН, вёска ў Шчадрынскім с/с Жлобінскага р-на Гомельскай вобл., каля р. Ала (2,5 *км*). Цэнтр калгаса «Чырвоная зорка». За 54 *км* на З ад Жлобіна, 137 *км* ад Гомеля, 28 *км* ад чыг. ст. Чырвоны Бераг. 656 ж., двароў 243 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, дзіцячыя яслі, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, швейная майстэрня, магазін.

КІЧЫНА (Кічынскае), возера ў бас. Абалянкі, левага прытока Лучосы, у Сенненскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 1,77 *км*². Даўж. 4 *км*, найб. шыр. 0,9 *км*, сярэдняя 0,4 *км*, найб. глыб. 8 *м*. Катлавіна выцягнута з ПнЗ на ПдУ, схілы высокія. Літараль пясчаная, у глыбокіх месцах дно ілістае. Вадазбор (15,2 *км*²) узгорысты, марэнны, пераважна пад ворывам. Воз. слаба праточнае; сцёк у Абалянку. Водзяцца карась, шчупак, плотка, карп.

КІШАЧНАПОЛАСЦЕВЫЯ (Coelenterata), тып многаклетачных беспазваночных. Каля 9 тыс. відаў, аб'яднаных у 3 класы: гідразоі, сцыфоідныя і *каралы*. Пашыраны ва ўсіх морах (у прэсных вадаёмах толькі некалькі відаў *гідраў* і *медуз*).

Самыя маленькія з К. (напр., *паліпы* на калоніях гідроідаў) дасягаюць 1 *мм*, найб. вялікая медуза цыянея мае парасонік да 2 *м*, шчупальцы расцягваюцца на 30 *м*. Цела большасці К. радыяльна-сіметрычнае, сценкі складаюцца з 2 слаёў эпітэлію (эктадэрмы і энтадэрмы) і студзінападобнай мезаглеі паміж слаямі. Многія маюць шкілет (вапнавы, іншы раз рагавы). На канцы цела рот, акружаны шчупальцамі, якія часта маюць жыгучыя клеткі. Нервовая сістэма дыфузная. Кішачная поласць слепа замкнёная. Большасць К. раздзельнаполыя. Шмат якія размнажаюцца пачкаваннем, у некат. чаргуецца полавае і бясполае размнажэнне. Прымацоўваюцца да субстрату (паліпы) або плаваюць (медузы). Некат. ўтвараюць калоніі (каралы). Кормяцца беспазваночнымі жывёламі. Ёсць прамысловыя (высакародны карал).

Літ.: Жизнь животных, т. 1, М., 1968.

У. П. Ляхновіч. Мінск.

КІШАЧНАЯ ПАЛАЧКА (Escherichia coli, Bacterium coli), няспоравая бактэрыя, якая жыве ў кішэчніку чалавека і жывёл. Адкрыў ням. вучоны Т. Эшэрых (1885).

Даўж. бактэрыі пераважна 1—2 *мкм*, таўшчыня 0,5 *мкм*. Найчасцей рухомая. Біяхімічна актыўная, здольная выклікаць малочнакіслае браджэнне вугляводаў і спіртоў. У звычайных умовах (у кішэчніку) пераважна непатагенная, у інш. органах можа выклікаць іх запаленне. Часам К. п. выклікае харч. атручэнні. Разам з экскрементамі трапляе ў глебу, ваду. У сан. мікрабіялогіі паказчык фекальнага забруджвання асяроддзя.

Літ.: Утевский Н. Л. Микробиология с техникой микробиологических исследований, 4 изд., М., 1965.

КІШАЧНЫ СОК, сакрэт залоз слізістай абалонкі *кішэчніка*. У саставе яго неарган. і арган. рэчывы. Асаблівае значэнне маюць ферменты (больш як 20): энтэракіназа, ды- і поліпептыдаза, ліпаза, амілаза, дыцукрыдаза; ёсць і прамежкавыя прадукты абмену рэчываў — ліпіды, вугляводы. К. с. удзельнічае ў заключным этапе ператраўлення яды. За суткі ў чалавека выдзяляецца больш як 3 *л* К. с.

Літ.: Шлыгин Г. К. Ферменты кишечника в норме и патологии, Л., 1967.

КІШКА Ян (г. н. невяд.— 26.7.1592), кальвініст, прыхільнік *антытрынітарыяў*. З магнацкага роду *Кішкі*. У 1563—64 вучыўся за мяжой. Крайчы літоўскі з 1569, падчашы літоўскі і староста жмудскі, каштэлян віленскі з 1587, ваявода брэсцкі з 1589, дзяржаўца быстрыцкі і цівун эйрагольскі. У Іўі заснаваў Арыянскую акадэмію (гл. *Арыянскія школы*), у мяст. Лоск — друкарню, дзе друкаваліся творы Пятра з Ганёндза і С. Буднага.

КІШКІ, магнацкі род Вял. кн. Літ. ў 15—17 ст. Паходзіў з Мазовіі. Найб. вядомыя:

Пётр (Пятрашка Пашковіч) па прозвішчы Кішка, кухмістр каралевы. Атрымаў ад каралл маёнткі на Беларусі (Нясвіж, Лахва), Валыні, Падляшшы і стаў буйным феадалам. З 1483 лідскі намеснік і маршалак гаспадарскі.

Станіслаў (п. у 1513 ці 1514), намеснік лідскі, стольнік літоўскі з 1491, маршалак гаспадарскі ў 1493—99, намеснік смаленскі ў 1500—03, гетман вял. літоўскі ў 1504—07, маршалак земскі ў 1512—13, гродзенскі староста з 1508. Шэсць разоў ездзіў з пасольствам у Маскву. Удзельнік войнаў з крымскімі татарамі (1497, 1503 і 1506) і Рус. дзяржавай (1500—03, 1507—08). Прыхільнік уніі з Польшчай. У 1498 атрымаў у спадчыну мяст. Лоск каля Ашмян.

Ян, кальвініст, гл. *Кішка* Ян.

Януш (каля 1586 — 13.1.1654), каралеўскі ротмістр і староста пярнаўскі з 1610, полацкі ваявода з 1621, гетман польны літоўскі з 1635, староста дрысенскі з 1640, гетман вял. літоўскі з 1646. Удзельнік войнаў з Швецыяй (1604—05, 1609, 1622) і Рус. дзяржавай (1611, 1615, 1618, 1633, 1634).

А. П. Грыцкевіч. Мінск.

КІШКІН Сяргей Міхайлавіч [н. 12(25).9.1909, в. Гусь-Завод Меленкаўскага пав. Уладзімірскай губ.], дзярж. і гасп. дзеяч БССР. З рабочых. Чл. КПСС з 1930. Скончыў Маскоўскі ін-т с.-г. машынабудавання імя Калініна (1935). У 1924—30 працаваў на Люберацкім з-дзе с.-г. машын (Маскоўская вобл.). У 1934—55 інжынер, гал. інжынер, нач. цэха, зборачнага корпуса, аддзела тэхн. кантролю Горкаўскага аўтазавода. З 1955 дырэктар Мінскага аўтазавода, нач. управўлення машына- і станкабудавання Саўнаргаса БССР, з 1962 нам. старшыні, старшыня Саўнаргаса БССР. З кастр. 1965 нам. старшыні Савета Міністраў БССР. На XXII і XXV з'ездах КПБ выбраны канд. у чл. ЦК, на XXVI—XXVII з'ездах чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета БССР 5—8-га скл. Дзярж. прэмія СССР 1951. Узнаг. ордэнам Леніна, 3 інш. ордэнамі, медалямі.

КІШКІН Сяргей Цімафеевіч [н. 30.5(12.6).1906, Луганск], савецкі вучоны ў галіне металургіі. Акад. АН СССР (1966, чл.-кар. 1960). Засл. дз. нав. і тэхн. РСФСР. Чл. КПСС з 1939. У 1931 скончыў Маскоўскае вышэйшае тэхн. вуч. імя Баўмана. У 1948—60 заг. кафедры Маскоўскага авіяц. ін-та. Працы па металургіі і металазнаўстве. Дзярж. прэміі СССР 1942, 1949, 1968. Узнаг. ордэнам Леніна, 3 інш. ордэнамі, медалямі.



Тв.: (Разам з С. З. Бакштэйнам) Исследование распределения и диффузии компонентов в металлических сплавах методом авторадиографии, М., 1955; (разам з А. М. Суліма і В. П. Строганавым) Исследование влияния наклепа на механические свойства и структуру сплава ЭИ437А, М., 1956; (разам з С. З. Бакштэйнам і Л. М. Мароз) Исследование строения металлов методом радиоактивных изотопов, М., 1959.

КІШМІШ (тадж.), група безнасенных сартоў вінограду, а таксама высушаныя ягады з гэтых сартоў (т. зв. разынкі).

КІШФАЛУДЗІ-ШТРОБЛЬ (Kisfaludi-Stróbl) Жыгманд (н. 1.7.1884, сяло Альшарайк), венгерскі скульптар. Нар. мастак ВНР (1956). Гапаровы чл. АМ СССР (1958). Праф. (1924). Аўтар рэаліст. скульптурных партрэтаў (Ш. Пецёфі, 1925; Б. Шоў, 1932; Ф. Э. Дзяржынскага, 1952) і статуй («Стралок з лука», 1918—19; «Работа ўсё ж пачалася», 1946). Сярод манумент. работ: помнік Вызвалення на гары Гелерт у Будапешце (1947), Манумент удзячнасці (1949), помнік Л. Кошуту (1952) і інш. У Дзярж. маст. музеі БССР — статуэтка «Лілея» (1922). Іл. гл. на ўкл. II да арт. *Венгрыя*.



Літ.: Ж. Кишфалуди-Штробл. Выставка произведений, М., 1955; Вучетич Е. В. Жигмонд Кишфалуди-Штробль, М., 1960.

КІШЧЫНА СЛАБАДА, вёска ў Барысаўскім р-не Мінскай вобл., на р. Нача. Цэнтр сельсавета і калгаса «Чырвоная зорка». За 20 *км* на Пн ад Барысава, 91 *км* ад Мінска, 25 *км* ад чыг. ст. Барысаў. 581 ж., гасп. 194 (1971). Сепаратарны пункт, швейная і шавецкая майстэрні. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, аддз. сувязі, 3 магазіны. У 1944 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў Айч. вайны.

КІШЧЫЦКІ РАССТРЭЛ 1905, расстрэл царскімі войскамі сялян в. Кішчыцы Чавускага пав. Магілёўскай губ. Вясной і летам 1905 сяляне пасвілі жывёлу на лузе, за які шмат гадоў судзіліся з памешчыкам маёнтка Сасноўка А. А. Гебелем. Па распараджэнні губернатара 17 чэрв. каморнікі з паліцыяй і 15-й ротай 314-га Каднікаўскага палка пачалі праводзіць мяжу паміж Чавускім і Горацкім пав., якая адначасова была мяжой і паміж памешчыцкімі і сялянскімі землямі. Сяляне вёскі не дазволілі праводзіць мяжы на карысць памешчыка. Спробы паліцыі разагнаць сялян не далі вынікаў. Паводле патрабавання прадстаўніка губернскіх улад Каханава салдаты пачалі страляць у сялян, забілі 8 і цяжка паранілі 15 чал. Да 50-годдзя першай рус. рэвалюцыі на месцы К. р. пастаўлены помнік з надпісам «Сялянам, расстраляным у час выступлення супраць царскага самадзяржаўя».

Кр.: Революционное движение в Белоруссии 1905—1907 гг. Документы и материалы, Мн., 1955, с. 158—160.

Літ.: Шабуня К. И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905—1907 гг., Мн., 1962, с. 212—213.

К. І. Шабуня. Мінск.

КІШЫ, вёска ў Глыбоцкім р-не Віцебскай вобл. Падпарадкоўваецца Падсвільскаму гарпасялковаму Савету. Цэнтр калгаса «Беларусь». За 32 *км* на ПнУ ад Глыбокага, 173 *км* ад Віцебска, 1 *км* ад чыг. ст. Падсвілле. 233 ж., двароў 78 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка. Помнік сав. воінам-землякам, якія загінулі ў Айч. вайну.

СПІС ІЛЮСТРАЦЫЙ НА АСОБНЫХ АРКУШАХ

Зямля — 1 ілюстрацыя (чатырохколерная аўтатыпія) . . . . . 16—17
Ігласкурыя — 15 ілюстрацый (афсет) . . 44—45
Іканапіс — 2 ілюстрацыі (чатырохколерная аўтатыпія) . . . . . 16—17
Ілюстрацыя — 31 ілюстрацыя на чатырох старонках (глыбокі друк) . . . . . 72—73
Інданезія — 8 ілюстрацый (глыбокі друк) 80—81
Індыя — 22 ілюстрацыі на трох старонках (глыбокі друк) . . . . . 96—97
Інтэр'ер — 6 ілюстрацый (глыбокі друк) 124—125
Іран — 8 ілюстрацый (глыбокі друк) 124—125
Іспанія — 15 ілюстрацый на дзвюх старонках (глыбокі друк) . . . . . 160—161
Італія — 30 ілюстрацый на чатырох старонках (глыбокі друк) . . . . . 176—177
Казахская ССР — 12 ілюстрацый на дзвюх старонках (глыбокі друк) . . . 216—217
Калгас — 25 ілюстрацый на чатырох старонках (глыбокі друк) . . . . . 248—249
Каменны век — 30 ілюстрацый на дзвюх старонках (глыбокі друк) . . . . . 296—297
Камуністычная партыя Беларусі — 18 ілюстрацый на трох старонках (глыбокі друк) . . . . . 328—329
Камуністычная партыя Заходняй Беларусі — 3 ілюстрацыі (глыбокі друк) 328—329
Камуністычная партыя Савецкага Саюза — 2 ілюстрацыі на дзвюх старонках (глыбокі друк) . . . . . 344—345
Канада — 8 ілюстрацый (глыбокі друк) 368—369
Кандытарская прамысловасць — 1 ілюстрацыя (афсет) . . . . . 44—45
Карыкатура — 7 ілюстрацый (глыбокі друк) . . . . . 368—369
Карэя — 14 ілюстрацый на дзвюх старонках (глыбокі друк) . . . . . 480—481
Касманаўтыка — 13 ілюстрацый на дзвюх старонках (глыбокі друк) . . . . . 488—489
Кветка — 42 ілюстрацыі на дзвюх старонках (афсет) . . . . . 540—541
Керамі́ка — 16 ілюстрацый на чатырох старонках (чатырохколерная аўтатыпія) . . . . . 552—553
Кіеў — 8 ілюстрацый (глыбокі друк) 560—561
Кіеўская Русь — 11 ілюстрацый (глыбокі друк) . . . . . 560—561
Кінамастацтва — 28 ілюстрацый на чатырох старонках (глыбокі друк) . . . 568—569
Кіргізская ССР — 13 ілюстрацый на дзвюх старонках (глыбокі друк) . . 584—585
Кітай — 28 ілюстрацый на чатырох старонках (глыбокі друк) . . . . . 608—609

СПІС КАРТАЎ

Зэльвенскі раён 8
Зямля. Карта свету, фізічная (каляровая) . . . . . 80—81
Іарданія 25
Іванаўская вобласць 32
Іванаўскі раён 33
Івана-Франкоўская вобласць 34
Івацэвіцкі раён 39
Ізраіль 57
Індакітай 81
Інданезія (каляровая) . . . . . 80—81
Інданезія, эканамічная карта 85
Індыйскі акіян (каляровая) . . . . . 80—81
Ірак, Іран (каляровая) . . . . . 136—137
Іран, эканамічная карта 142
Іркуцкая вобласць 147
Ірландыя 150
Ісландыя 158
Іспанія і Партугалія (каляровая) . . . 136—137
Іспанія, эканамічная карта 162
Ісык-Кульская вобласць 169
Італія (каляровая) . . . . . 168—169
Італія, эканамічная карта (каляровая) 168—169
Іўеўскі раён 182
Емен 187
Кабардзіна-Балкарская АССР 194
Казахская ССР (каляровая) . . . . . 216—217
Казахская ССР, эканамічная карта . . . 216—217
Канчэтаўская вобласць 240
Калінінградская вобласць 260
Калінінская вобласць 261
Калінкавіцкі раён 263
Калмыцкая АССР 268
Калужская вобласць 274
Калумбія 276
Камбоджа 292
Каменны век на тэрыторыі Беларусі (каляровая) . . . . . 312—313
Камерун 304
Камсамольскія падпольныя арганізацыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (каляровая) . . . . . 312—313
Камчацкая вобласць 360
Камянецкі раён 363
Канада (каляровая) . . . . . 368—369
Канада, эканамічная карта . . . . . 368—369
Капыльскі раён 416
Карагандзінская вобласць 422
Каракалпакская АССР 424
Карачаева-Чэркеская аўтаномная вобласць 435
Кардыльеры Паўночнай Амерыкі, араграфічная схема 440
Кармянскі раён 447
Карпаты, араграфічная схема 457
Карты, узоры (каляровая) . . . . . 464—465
Карэліцкі раён 472
Карэльская АССР 474
Карэя (каляровая) . . . . . 464—465
Карэя, эканамічная карта 481
Кастрамская вобласць 500
Касцюковіцкі раён 504
Каўказ, араграфічная схема 516
Кашкадар'інская вобласць 528
Кемераўская вобласць 547
Кенія 549
Кзыл-Ардзінская вобласць 555
Кіеўская вобласць 559
Кіеўская Русь у IX — пачатку XII ст. (каляровая) . . . . . 560—561
Кіпр 575
Кіраваградская вобласць 577
Кіраўская вобласць 581
Кіраўскі раён 582
Кіргізская ССР (каляровая) . . . . . 560—561
Кіргізская ССР, эканамічная карта . . . 585

СУПРАЦОЎНІКІ ГАЛОЎНАЙ РЭДАКЦЫІ БелСЭ, ЯКІЯ ЎДЗЕЛЬНІЧАЛІ Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ І ВЫДАННІ 5 ТОМА

КІРАЎНІЦТВА ГАЛОЎНАЙ РЭДАКЦЫІ

Галоўны рэдактар — акад. АН БССР П. У. Броўка. Намеснік галоўнага рэдактара — д-р філас. навук праф. П. Дз. Пузікаў. Намеснік галоўнага рэдактара — І. Д. Казека. Адказны сакратар рэдакцыйнай калегіі — канд. гістар. навук А. Л. Петрашкевіч. Намеснік галоўнага рэдактара па вытворчасці — П. П. Журкевіч.

НАВУКОВА-ГАЛІНОВЫЯ І КАНТРОЛЬНЫЯ РЭДАКЦЫІ

Біялогія, медыцына і сельская гаспадарка

Заг. рэд.— канд. біял. навук Р. К. Кажэўнікава; ст. навук. рэдактары: Л. М. Гаршанава, М. А. Кулікава; навук. рэдактары: В. М. Прусакова, А. У. Усцінава; мал. рэдактар М. В. Стральчэня.

Геаграфія і геалогія

Заг. рэд.— Я. А. Якубоўскі; ст. навук. рэдактар І. Д. Несцяровіч; навук. рэдактары: В. П. Варанцова, В. М. Вераценнікава, Т. І. Гузава, С. В. Курач, А. А. Шаўрова; рэдактар В. С. Вайткевіч; мал. рэдактар Н. Я. Ніканюк.

Гісторыя БССР і археалогія

Заг. рэд.— канд. гістар. навук Э. М. Савіцкі, ст. навук. рэдактар М. І. Камінскі; навук. рэдактар В. В. Гетаў; мал. рэдактар А. І. Валахановіч.

Гісторыя СССР, КПСС і КПБ

Заг. рэд.— канд. гістар. навук І. П. Хаўратовіч; ст. навук. рэдактары: А. І. Марозава, Н. А. Русак, В. С. Семенякоў; навук. рэдактары: В. М. Барадуліна, Ф. Я. Кляцкоў, В. С. Паваліхіна; мал. рэдактар А. С. Жмуроўскі.

Літаратура, мова, фальклор і этнаграфія

Заг. рэд.— В. І. Рабкевіч; ст. навук. рэдактары: В. К. Небышынец, канд. філал. навук І. У. Саламевіч; мал. рэдактар Р. А. Ларчанка.

Мастацтва і архітэктура

Заг. рэд.— канд. мастацтвазнаўства А. А. Лабовіч; ст. навук. рэдактары: канд. мастацтвазнаўства дацэнт Г. І. Барышаў; А. А. Саламаха; навук. рэдактары: М. М. Клімковіч, Дз. У. Стэльмах; рэдактар Г. П. Прахарэнка.

Народная асвета і друк

Заг. рэд.— канд. філас. навук Дз. П. Радзюк; ст. навук. рэдактар І. І. Смірнова; навук. рэдактар А. С. Ткачова; рэдактар Н. І. Стаховіч.

Тэхніка

Заг. рэд.— Л. С. Караічаў; навук. рэдактары: І. У. Косціна, Б. С. Мельнікаў.

Усеагульная гісторыя

Заг. рэд.— канд. гістар. навук В. П. Жукаў; ст. навук. рэдактар А. Дз. Зубар; навук. рэдактар Н. І. Кліменка; мал. рэдактар Г. М. Булат.

Фізіка, матэматыка, хімія і астраномія

Заг. рэд.— канд. фіз.-матэм. навук У. М. Трацяк; ст. навук. рэдактар В. В. Хадыка; навук. рэдактар Г. І. Раманава; мал. рэдактар З. І. Іўчанка.

Філасофія і права

Заг. рэд.— А. П. Ратайка; ст. навук. рэдактар З. П. Кузьмічэнка; навук. рэдактары: М. А. Іваноўіч, А. І. Казачок.

Эканоміка

Заг. рэд.— У. А. Салановіч; ст. навук. рэдактар І. Ц. Рудаман; навук. рэдактар Н. П. Саламевіч; мал. рэдактар Н. К. Матвеенцава.

Навукова-кантрольная рэдакцыя

В. а. заг. рэд.— С. П. Самуэль; ст. навук. рэдактары: канд. мастацтвазнаўства Т. Дз. Арлова; І. Я. Афнагель, У. М. Сацута; навук. рэдактар Т. У. Тамільчык; мал. рэдактары: Л. С. Іванова, Л. П. Маліконак.

Група бібліяграфіі. Навук. рэдактары: Т. Р. Сабаленка, А. А. Тарасава; рэдактар І. В. Нічыпарчык; мал. рэдактар Л. В. Календа.

Літаратурна-кантрольная рэдакцыя

Заг. рэд.— І. А. Скрыган; ст. навук. рэдактары: М. К. Клышка, Н. М. Слімашка; навук. рэдактары: М. Р. Каваленка, Е. П. Фешчанка; рэдактар М. Э. Самуйлёнак.

Група транскрыпцыі. Навук. рэдактары: І. П. Крэнь, Н. А. Ясінская; мал. рэдактар Г. А. Фатыхава.

Рэдакцыя слоўніка

Заг. рэд.— Н. П. Колас; рэдактар В. А. Міхайлоўская; мал. рэдактары: М. І. Бязладнава, М. А. Федасеенка.

Рэдакцыя ілюстрацыі і картаграфіі

Заг. рэд.— С. П. Русак; ст. навук. рэдактар Л. І. Бетаў; мал. рэд. Н. І. Кукіна.

Група картаграфіі. Ст. навук. рэдактар-картограф Н. М. Махавікова; навук. рэдактар-картограф Г. Р. Шыкунова; рэдактар-картограф Я. П. Цупа; чарцёжніца-афарміцель Л. А. Панцялеева.

Група падрыхтоўкі фотаілюстрацый. Маст. рэдактары: Р. Ф. Валадзько, П. М. Захарэнка.

АДДЗЕЛЫ І ГРУПЫ

Вытворчы аддзел

Заг. аддзела — У. М. Вержбаловіч; ст. рэдактар Н. П. Сцяпанава; ст. тэхн. рэдактар Г. І. Емец; выпускаючы З. М. Белавус.

Лабараторыя фотакапіравальных размнажальных апаратаў. Загадчык — В. А. Трубчак; друкар Р. М. Данілік; пераплётчыца-электрафатограф Ф. І. Кароль; пераплётчыца-фотанаборшчык Я. М. Кузьміна.

Машынапіснае бюро. Заг. бюро — Л. Л. Ляшчынская; машыністкі-перакладчыцы: Г. А. Анісімава, В. У. Маслоўская, Н. П. Ракіцкая.

Карэктарскі аддзел

Заг. аддзела — Г. І. Ткачова; ст. карэктары: В. І. Багдановіч, Н. Ф. Багдановіч, Л. У. Заватка, Л. Дз. Лебедзева, В. І. Плашчынская, Л. А. Сівалобчык; карэктары: Л. І. Дорская, Л. Ц. Спірыдонава.

Група камплектавання

Рэдактар М. І. Макаранка; мал. рэдактар А. К. Броннікаў.

Службовы персанал

Гал. бухгалтар А. Ц. Крыўчык; ст. бухгалтар М. І. Плаціцына; ст. інспектар Л. А. Антаневіч; ст. інспектар па кадрах А. П. Калеснікаў; ст. планавік-эканаміст Т. І. Лук'янава; заг. навук. архіва К. І. Бронніка; ст. бібліятэкар Г. Я. Няхайчык; бібліятэкар-бібліёграф Л. М. Мацвеева; сакратар-машыністка Л. В. Парнякова; заг. матэрыяльнага склада А. К. Пацехіна; ст. эканаміст па забеспячэнні Я. Р. Кляцко.

ВЫТВОРЧЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ, ЯКІЯ ЎДЗЕЛЬНІЧАЛІ Ў ВЫДАННІ 5 ТОМА БелСЭ

Паліграфічны камбінат імя Якуба Коласа

Дырэктар Р. А. Шаўчэнка; галоўны інжынер С. Ц. Сізаненка; галоўны тэхнолаг Р. І. Шапавалава; начальнік вытворчага аддзела К. С. Каламейцава; начальнік наборнага цэха К. П. Федарук; ст. майстар цэха П. А. Сержан; тэхнолаг цэха Л. В. Абраменка; майстры лінатыпнага аддзялення: В. А. Салдаценка, Г. У. Крыштаповіч; лінатыпісткі: Н. Ф. Церахава, Г. Я. Жардзецкая; праўшчыца М. І. Ясюкевіч; майстар вярстальнага аддзялення Е. І. Фінкель; вярстальшчык І. П. Казлоўскі; майстар абкладачнага аддзялення Ф. І. Жукоўскі; апаратар варыяклішографа У. П. Стукач; травільшчыкі: Б. І. Акола, В. А. Апарын; заг. карэктарскай Л. І. Ліхтаровіч; карэктары: Л. В. Апаровіч, Т. Дз. Панушкіна; начальнік друкарскага цэха А. М. Капусцік; ст. майстар цэха М. У. Яскевіч; тэхнолаг цэха Г. Л. Валчок; майстры цэха: А. І. Гладун, Я. Дз. Жукоўская, Л. Я. Рашэтнікава; брыгада друкароў: А. П. Абмётка, Р. М. Бандарэнка, У. Ю. Мароз, І. А. Насевіч, І. М. Мілеўскі, Ф. В. Навахрост, Б. А. Чарняўскі; начальнік афсетнага цэха Г. Г. Каралёва; тэхнолаг цэха Я. А. Куляшова; майстар рэтушорнага аддзялення В. П. Міхальчын; рэтушор Л. Г. Філіповіч; майстар друкарскага аддзялення А. Дз. Тазіева; брыгада друкароў: А. А. Бандарэнка, П. М. Парфенчык; начальнік пачнага цэха Р. П. Хмялеўская; тэхнолаг цэха Т. М. Быліна; майстар Н. М. Дражына; пазалотчыцы: В. В. Баравік, М. П. Варанкова, Л. А. Кіневіч, Н. П. Шарапава; начальнік пераплётна-брашуровачнага цэха Б. І. Штульман; ст. майстар цэха З. А. Худава; тэхнолаг цэха В. М. Савіцкая; майстры цэха: З. І. Вішнеўская, Н. В. Крылова, С. С. Крэза, В. У. Савіцкая, І. А. Сінкевіч, З. С. Ячнік, Э. У. Бубенава, Л. З. Левіна; машыніст БТГ Л. В. Квяткоўскі, машыністы В-2: Г. М. Касцевіч, З. І. Рак; швачкі: М. М. Канаш, К. С. Левандоўская, Я. З. Няхайчык, К. М. Памазанава, Г. К. Пятроўская; машыніст БПА Т. Ф. Іванові; прыклейшчыцы: І. Ю. Гладкая, Р. А. Жаўнова, С. С. Раманчык; рэзчыкі: Т. М. Сідарэнка, Л. А. Штанюк.

Друкарня Выдавецтва ЦК КПБ

Дырэктар П. А. Цароў; галоўны інжынер П. В. Карпаў; намеснік дырэктара па вытворчасці С. Г. Сцяпанаў; галоўны тэхнолаг Р. І. Жытомірскі, тэхнолаг Л. М. Ачыновіч; начальнік цэха глыбокага друку С. М. Пасмяцюха; майстры цэха У. І. Варапай, А. М. Сянькевіч, І. А. Шпакоўскі; фатограф М. А. Роганаў; рэтушоры: У. Д. Бурак, М. Л. Вадаванос, Л. А. Навікоўскі; травільшчыкі: Я. В. Гаўрылаў, А. І. Смурага; друкары: П. А. Каспяровіч, В. П. Сальнікаў.

Фабрыка № 2 ГУГК пры Савеце Міністраў СССР

Дырэктар В. В. Урусаў; галоўны інжынер А. А. Ляўшынаў; начальнік цэха № 1 М. С. Рутковская; ст. рэдактар Г. І. Гулюк; рэдактары: С. М. Герасімава, В. С. Собалева; інжынер-картограф Л. Ф. Жмака; тэхнікі-картографы: І. В. Арцюх, А. К. Мілюткіна; тэхнічны рэдактар І. Г. Раманюк; начальнік цэха № 2 А. І. Бабуркін; ст. майстар А. В. Свірына; прабіст А. М. Багдановіч; гравёр З. А. Баранчык; капіроўшчык М. М. Васілеўскі; начальнік цэха № 3 Я. І. Негнявіцкі; майстры цэха: Я. П. Варывончык, А. І. Кірылкіна; друкары: С. І. Гучок, А. І. Магілевіч.

Ілюстрацыі на ўклейках і ў тэксце выканалі мастакі: М. М. Свілгін, А. П. Сякірын, А. Р. Федзін.

У томе змешчаны фотаздымкі А. К. і М. П. Ананьіных, П. М. Захарэнкі, Л. І. Папковіча, а таксама фотаздымкі ТАСС, АДН, БелТА, фондаў Дзяржаўнага музея Беларускай ССР, Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Цэнтральнага дзяржаўнага архіва кіна-, фота-, фонадакументаў БССР, Беларускага тэатральнага таварыства.

03
Б43 Беларуская Савецкая Энцыклапедыя
Гал. рэд.— П. У. Броўка.
Т. 5 — Галоўная рэдакцыя Беларускай Савецкай Энцыклапедыі, Мн., 1972.
Т. 5. Зуйкі — Кішы. 616 стар. з іл. і картамі.

Белорусская Советская Энциклопедия, т. 5
(на белорусском языке).
Галоўная рэдакцыя Беларускай Савецкай Энцыклапедыі. Мінск, Акадэмічная, 15-а.

У томе змешчана: 24 уклейкі глыбокага друку (340 ілюстрацый), 2 уклейкі афсетнага друку (58 ілюстрацый), 9 уклеек каляровых картаў, 3 уклейкі каляровага высокага друку (19 ілюстрацый), у тэксце 670 ілюстрацый і 49 картаў. Папера для тэксту выраблена на фабрыцы імя Ю. Японіса. Каляровыя карты надрукаваны на фабрыцы № 2 ГУГК. Уклейкі глыбокага друку надрукаваны ў друкарні Выдавецтва ЦК КПБ.

Здадзена ў набор 26.8.1971 г., падпісана да друку 14.2.1972 г. АТ 11 111. Тыраж 25 000 экз. Фармат 70×100¹/₁₆. Фіз. друк. арк. 38,5+4,5 арк. ўклеек. Ум. друк. арк. 50,05+5,85 арк. ўклеек. Усяго ўлікова-выдавецкіх арк. 98. Цана 2 р. 50 к. Зак. 903.

Паліграфічны камбінат імя Якуба Коласа. Мінск, Красная, 23.